Белорус.
03
Б-43

БЕЛ
СЭ

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ
БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

П. У. БРОЎКА (галоўны рэдактар), Р. І. АРЫКА, К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва), І. І. АХРЭМЧЫК, М. А. БАРЫСЕВІЧ, П. Ф. ГЛЕБКА, І. Д. КАЗЕКА (намеснік галоўнага рэдактара), Р. Я. КІСЯЛЁЎ, А. К. КРАСІН, К. І. ЛУКАШОЎ, А. В. ЛЫКАЎ, Ф. С. МАРЦІНКЕВІЧ, А. С. МАХНАЧ, М. Дз. НЕСЦЯРОВІЧ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (адказны сакратар), П. Дз. ПУЗІКАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), М. Я. САЎЧАНКА, С. Г. СКАРАПАНАЎ, Я. І. СКУРКО (Максім Танк), Ф. І. ФЁДАРАЎ, К. І. ШАБУНЯ, Р. Р. ШЫРМА, М. Ф. ЯРМОЛЕНКА, М. П. ЯРУГІН.

ТОМ II

АФІНЫ—ВЕДРЫЧ

МІНСК. 1970

03
Б 43

РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ

П. У. БРОЎКА (старшыня савета), Л. С. АБЭЦЭДАРСКІ, І. І. АНТАНОВІЧ, В. К. БАНДАРЧЫК, В. В. БАРЫСЕНКА, Г. І. БАРЫШАЎ, А. І. БОЛСУН, С. Х. БУДЫКА, І. А. БУЛЫГІН, К. П. БУСЛАЎ, Г. К. ГАРАНСКІ, Д. М. ГОЛУБ, Г. Х. ДАЎГЯЛА, В. А. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ, М. У. ДЭМБІНСКІ, М. А. ЕЛЬЯШЭВІЧ, В. Р. ЗАЎРЫЕЎ, В. У. ІВАШЫН, І. М. ІГНАЦЕНКА, В. М. КАВАЛГІН, Г. Ц. КАВАЛЕЎСКІ, Р. К. КАЖЭЎНІКАВА, М. С. КАЗЛОЎ, Н. В. КАМЕНСКАЯ, Р. В. КАНАВАЛАЎ, М. Ф. КАПІЧ, У. А. КАРОЛЬ, У. І. КРЫЛОЎ, Г. М. ЛІЎШЫЦ, М. П. ЛОБАН, І. М. ЛУШЧЫЦКІ, С. М. МАЛІНІН, В. С. МАЎРЫШЧАЎ, Дз. М. МАЦЯС, Б. П. МІЦКЕВІЧ, М. Р. МУРАШКА, У. І. НЯФЕД, Ф. М. ПЯЧАЎ, М. П. ПАЛЕТЫКА, Э. М. ПОЗНЯК, П. Ф. РАКІЦКІ, М. Т. РАМАНОЎСКІ, В. П. СЕВЯРДЗЕНКА, У. М. СІКОРСКІ, І. А. СКРЫГАН, Р. Л. СТАРОВІНЕЦ, М. Р. СУДНІК, Дз. А. СУПРУНЕНКА, В. І. СЦЯПАНАЎ, І. І. ТРУХАН, С. А. УМРЭЙКА, В. В. УРУСАЎ, І. П. ХАЎРАТОВІЧ, Р. С. ЧАБАТАРОЎ, У. А. ЧАНТУРЫЯ, М. Я. ШКЛЯР, В. А. ШКУРКО, Л. М. ШНЕЕРСОН, В. І. ШЭМПЕЛЬ, Э. А. ЮШКЕВІЧ, В. І. ЯЛАТАЎ, П. І. ЯШЧАРЫЦЫН.

ТЭРМІНАЛАГІЧНАЯ КАМІСІЯ

К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва) — старшыня камісіі, М. Р. СУДНІК — намеснік старшыні камісіі; члены камісіі: М. В. БІРЫЛА, П. У. БРОЎКА, М. М. ГАНЧАРЫК, Г. І. ГАРЭЦКІ, І. Д. КАЗЕКА, А. А. КАРАТАЙ (Максім Лужанін), Ц. В. КРЫСЬКО (Васіль Вітка), М. П. ЛОБАН, В. І. РАБКЕВІЧ, І. І. СЕМЯЖОНАЎ (Язэп Семяжон), І. А. СКРЫГАН, Ф. І. ФЕДАРАЎ, Л. М. ШАКУН, Ф. М. ЯНКОЎСКІ.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ 2-ГА ТОМА

І. П. АНТОНАЎ, П. Ц. АСТАШЭНКАЎ (Масква), С. Р. АЎСЯННІКАЎ, Ю. С. БАГДАНАЎ, У. А. БЕЛЫ (Гомель), Б. Б. БОЙКА, Р. В. БУЛАЦКІ, Дз. П. БЯЛЯЦКІ, Н. Б. ВАТАЦЫ, А. С. ВЕЧАР, І. Ф. ГАРКУША, В. В. ГАЎРЫЛЮК, Ф. Дз. ГАХАЎ, Н. С. ГІЛЕВІЧ, Дз. П. ГОРСКІ (Масква), А. Е. ГУРЫНОВІЧ, М. П. ДАРАФЕЕНКА, А. В. ДУЛАЎ, М. П. ЕРПЫЛЕЎ (Масква), А. І. ЗАЛЕСКІ, І. С. КАВАЛЕЎ, Л. В. КАЗЛОЎСКАЯ, У. А. КАЛЕСНІК (Брэст), У. С. КАМАРОЎ, Я. Р. КАНАВАЛАЎ, Г. В. КІСЯЛЕЎ (Вільнюс), У. М. КОНАН, А. В. КРАСІНСКІ, М. І. КРАСОЎСКІ, В. Р. КРАСТОЎСКІ, М. Р. КРУЦЬКО, В. Я. КРЫШЧАНОВІЧ, К. А. КУЛІНКОВІЧ, І. І. КУПЧЫНАЎ (Гомель), І. І. ЛЕАНОВІЧ, П. П. ЛІПІЛА, А. А. ЛОЙКА, В. Дз. МАРОЗАЎ, А. І. МЕТЧАНКА, (Масква), В. Ф. МЯДЗВЕДЗЕЎ, І. Я. НАВУМЕНКА, Г. Л. НАПРЭЙ, І. М. ПАНЬШЫНА, М. І. ПАХОМАЎ, П. Ф. ПРАТАСЕНЯ, Р. М. САМАРЫН (Масква), А. К. САННІКАЎ, В. І. СЕМЯНКОЎ, Дз. Ф. СІДАРЭНКА, Н. А. СНІЦАРАВА, Г. К. ТАТУР, М. Я. ЦІКОЦКІ, Г. І. ЦІТОВІЧ, Л. С. ШАЎМЯН (Масква), Г. В. ШТЫХАЎ, В. П. ЯКУШКА.

Центральная научная
БИБЛИОТЕКА
Академии наук Киргизской ССР
360853

Аа Бб Вв Гг Дд Ее Ёё Жж Зз Ии Йй Кк Лл Мм Нн Оо Пп Рр Сс Тт Уў Фф Хх Цц Чч Шш Ыы Ьь Ээ Юю Яя

Фінікійская · Старажытнагрэчаская · Візантыйская · Глаголіца Балгарская 11 ст. · Устаў 11 ст. · Царкоўнаславянская 13—16 ст. · Царкоўнаславянская 16—18 ст. · Скорапіс 15 ст. · Беларускі скорапіс 16 ст. · Паўустаў канца 17 ст. · Грамадзянская пач. 18 ст. · Лацінская

АФІНЫ (Athēnai) Старажытныя, горад-дзяржава (поліс) у Ст. Грэцыі ў паўд. частцы *Атыкі*. Археал. раскопкі выявілі на *Акропалі* паселішча 16—13 ст. да н. э. Удзельнічалі ў *Траянскай вайне*. У час дарыйскага нашэсця (12—11 ст. да н. э.) адстаялі сваю незалежнасць. Пасля смерці апошняга цара Кодра Афінамі кіравалі *арханты*. Усталявалася арыстакр. рэспубліка. У архаічны перыяд (8—6 ст. да н. э.) ішоў працэс распаду родаплемяннога ладу, узнікла прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, рамяство аддзялілася ад земляробства, гандаль стаў рэгулярны, з'явіліся грошы, крэдыт, пазыковае рабства. Зямля паступова пераходзіла ў рукі родавай арыстакратыі (эўпатрыдаў), якая падпарадкавала сабе большасць свабоднага насельніцтва. Закончылася аб'яднанне гарадоў і абшчын Атыкі вакол А. Пасля рэформаў *Салона* (594 да н. э.) пазыковае рабства ліквідавана, абмежавана ўлада эўпатрыдаў, уведзены маёмасны цэнз. Рэформы *Клісфена* ўсталявалі рабаўладальніцкую дэмакратыю. У А. класічнага перыяду (5 ст. — апошняя чвэрць 4 ст. да н. э.) усё больш развіваўся рабаўладальніцкі лад. А. сталі самай вялікай дзяржавай Ст. Грэцыі. У перыяд *грэка-персідскіх войнаў* 500—449 да н. э. некалькі разоў перамагалі персаў. Узначальвалі Дэлоскі саюз, які пазней ператварыўся ў афінскую марскую дзяржаву (гл. *Архе Афінская*). Перыядам найбольшага культурнага росквіту А. быў т. зв. «залаты век Перыкла», ён даў выдатных вучоных, мысліцеляў, пісьменнікаў, мастакоў: *Герадота, Анаксагора,* Сафокла, *Фідыя, Сакрата* і інш. Аднак далейшае развіццё рабаўладальніцкай эканомікі к канцу 5 ст. да н. э. перарасло вузкія граніцы грэч. полісаў і выклікала ў іх цяжкі сац. і паліт. крызіс. У *Пелапанескай вайне* 431—404 да н. э. А. пацярпелі паражэнне, у ходзе *Карынфскай вайны* 395—387 да н. э. часткова аднавілі сваю магутнасць. Пасля перамогі македон. цара *Філіпа II* над кааліцыяй грэч. гарадоў (338 да н. э.) А. апынуліся пад уладай Македоніі. У 86 да н. э. захоплены рымлянамі, з 27 да н. э. ў складзе рым. правінцыі Ахаі.

Кр.: Рус. пер. — Аристотель. Афинская полития. Государственное устройство афинян, 2 изд., М., 1937; Плутарх. Сравнительные жизнеописания, т. 1, М., 1961.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; История древней Греции, М., 1962.

Ф. М. Пячай. Мінск.

АФІНЫ, сталіца Грэцыі, адміністрацыйны цэнтр нома (вобласці) Атыкі. Паліт., эканам. і культурны цэнтр краіны. Размешчаны ў паўд. частцы п-ва Атыка, на раўніне, якая з трох бакоў абкружана невысокімі гарамі, а на ПдЗ абмываецца заліваам Саранікос. Горад разам з портам Пірэй, які фактычна зросся са сталіцай, называецца Вялікія А. 2 млн. ж. (1968). Вялікія А.— вялікі вузел чыгуначных, шашэйных, марскіх і паветраных шляхоў. Есць метро. На Вялікія А. прыпадае каля $^2/_3$ прамысл. прадукцыі Грэцыі. Прамысловасць: тэкст. (1-е месца па колькасці рабочых), швейная, абутковая, харч. і тытунёвая, металург. і металаапр., суднабудаўнічая, хім., гарбарная, папяровая, цэментная, нафтаперапрацоўчая. Вытв. мэблі, дываноў; кераміка і інш. А. — старажытны горад Грэцыі. Горад-дзяржава ў Атыцы (гл. *Афіны* Старажытныя). У 146 да н. э. падпаў пад уладу Рыма, у 4 ст. — Візантыйскай імперыі. З 1204 сталіца Афінскага герцагства. У 1458 захоплены туркамі. Пасля вызвалення Грэцыі ад тур. панавання сталіца грэч. дзяржавы (з 1834). У гады ням.-фаш. акупацыі (1941—44) — цэнтр падпольнай і забастовачнай барацьбы супраць акупантаў. Вызвалены 13.10.1944 сіламі ЭЛАС — войскамі грэч. Нац.-вызв. фронту. А. — найбуйнейшы цэнтр развіцця ант. культуры. У афінскім Акропалі ў 5 ст. да н. э. пабудаваны храм Афіны Парфенас (Дзевы)— Парфенон, храм Ніке Аптэрас, Эрэхтэён, Прапілеі (парадны ўваход). Сярод інш. помнікаў: плошча Агары з храмам Гефеста, Дыпілан — гал. гарадскія вароты стараж. Афінаў, Дыпілонскі некропаль з многімі скульпт. надмагіллямі, храм Зеўса Алімпій-



Выгляд Афін з Акропаля.

скага, тэатр Дыяніса, адэон Ірада Атыка, бібліятэка і арка Адрыяна, стадыён, Вежа вятроў, помнік Лісікрата. Да візант. эпохі належаць цэрквы 11—12 ст. — Агіяс Элеўтэрыяс (Малая Мітраполія), св. Апосталаў на Агары, Каппікарэя. Сучасная геам. планіроўка А. і найбольш значныя грамадскія будынкі (нац. археал. музей, нац. б-ка, парламент і інш.) створаны ў стылі класіцызму ў 19 ст. З 1950 ідзе рэканструкцыя гал. плошчаў (Амоніяс, Сінтагматос) і вуліц. Ген. план 1965—67 прадугледжвае выйсце А. да заліва Саранікос і ўключае вялікія жыллёвыя і прамысл. раёны. Ун-т (з 1837), 11 інш. ВНУ, Акадэмія навук, археал. НДІ. Музеі: Нац. археалагічны, Акропаля, Агары, Візантыйскі, Бенакі, Нац. галерэя жывапісу.

Літ.: Колобова К. М. Древний город Афины и его памятники, Л., 1961; Сидорова Н. А. Афины, М., 1967.

АФІЦЫЁЗ (лац. officiosus літар. паслужлівы), орган друку (газета, часопіс, бюлетэнь і інш.), які не з'яўляецца афіцыйным выданнем урада або кіруючай партыі, але выяўляе і падтрымлівае іх погляды на пытаннях унутранага і міжнароднага жыцця. Напр., у ЗША адно з афіцыёзных выданняў — час. «United States News and World Report» («Навіны Злучаных Штатаў і сусветны агляд»), адлюстроўвае інтарэсы буйнога манапал. капіталу.

АФІЦЭРАЎ Пётр Іванавіч (н. 18.8.1928, в. Стрыкілі Горацкага р-на Аршанскай акругі), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1959). Чл. КПСС з 1959. Працоўную дзейнасць пачаў з 1944 у калгасе «Шлях Леніна» Горацкага р-на Магілёўскай вобл. З 1955 брыгадзір комплекснай брыгады калгаса.

АФІША (франц. affiche), аб'ява, звычайна друкаваная, пра спектаклі, канцэрты і інш. відовішчы. На Беларусі А. (праграмы) з'явіліся ў 18 ст. Вядомыя мінская А. ад 9.2.1852 з выпадку пастаноўкі «Сялянкі» С. Манюшкі, рукапісная А. на бел. мове ад 7.4.1906, якая паведамляла пра спектакль «Па рэвізіі» М. Краіўніцкага, і інш.

Літ.: Гурьев Б. О чем рассказывают афиши, «Неман», 1961, № 6.

АФОРТ (франц. eau-forte літар. моцная вада, азотная кіслата), тэхнічная разнавіднасць паглыбленай гравюры на метале (іголкавы ці штрыхавы афорт — медзярыт).

Тэхніка вырабу А.: на медную ці цынкавую дошку наносяць кіслотаўстойлівы лак (сумесь асфальту, воску і смалістага рэчыва, найчасцей каніфолі). Лак накатваюць на падагрэтую дошку (цвёрды грунт) ці, растварыўшы ў шкіпінары, наносяць пэндзлем (вадкі грунт). Потым спецыяльнымі афортнымі іголкамі прадрапваюць малюнак на грунце, так, каб у месцах, дзе прайшла іголка, агаліўся метал. Падрыхтаваную такім чынам дошку апускаюць у азотную кіслату, якая раз'ядае метал у штрыхах і робіць іх паглыбленымі. Каб атрымаць лініі рознай глыбіні і сілы, дошку травяць паўторна, паслядоўна закрываючы вадкім лакам месцы, якія павінны быць святлейшыя. Пасля гэтага грунт змываюць з дошкі, накатваюць на яе фарбу і друкуюць на ўвільготненай паперы. Каляровы А. друкуецца з дошак, размаляваных ад рукі.

Тэхніка А. вынайдзена ў 16 ст. ў Германіі (Д. Гопфер, А. Дзюрэр, які карыстаўся жалезнымі дошкамі). Росквіту А. дасягнуў у 17 ст. ў творчасці галандскіх афартыстаў, асабліва Рэмбранта. З той пары А. належыць да найбольш пашыраных і ўлюбёных мастакамі відаў гравюры. У Расіі А. займаліся А. Зубаў, Я. Чэмесаў, І. Шышкін, В. Сяроў, В. Матэ і інш., у савецкі час — Г. Вярэйскі, І. Нівінскі, М. Даброў, Э. Окас і інш. На Беларусі вядомыя афорты Л. Рана, А. Паслядовіч, А. Кашкурэвіча, Г. Паплаўскага і інш. Іл. гл. на ўклейцы.

АФРАДЫТА (Aphroditē), у грэчаскай міфалогіі багіня кахання і харaства. Характарам і паходжаннем блізкая да ўсх. Астарты. У рымлян А. адпавядае Венера. У творах мастацтва ўвасабляла ідэал жаночага харaства. З мностваантык. скульптур А. абярэгліся толькі некаторыя. Самыя лепшыя: А. (Венера) Мілоская — невядомага аўтара (у Луўры, Парыж), А. Кнідская — работы Праксіцеля, А. Медычы (у Фларэнцыі), А. Таўрыйская (у Эрмітажы, Ленінград) і інш.



Афрадыта (Венера) Мілоская.

АФРЫКА, другі па велічыні (пасля Азіі) мацярык і адпаведная частка свету. Экватарам дзеліцца амаль напалам. Крайнія пункты мацерыка: паўн.— мыс Эль-Аб'яд (37°20′ паўн. ш.), паўд.— мыс Ігольны (34°51′ паўд. ш.), зах.— мыс Альмады (17°32′ зах. д.), усх.— мыс Хафун (51°24′ усх. д.). На Пн берагі А. абмываюцца Міжземным м., на З Атлантычным ак., на У Індыйскім ак. і Чырвоным м. Суэцкі перашыек, праз які праходзіць канал, злучае А. з Азіяй. Ад Еўропы А. аддзяляецца Гібралтарскім пралівам (найменшая шыр. 14 *км*). Берагі А. прамалінейныя, пераважна гарыстыя з вузкімі палосамі прыбярэжных нізін. Мала заліваў і зручных бухтаў. На З самы вялікі заліў Гвінейскі, у Міжземным м.— Сідра, у Індыйскім ак.— Адэнскі, які абмывае паўн. берагі самага вялікага паўвострава А. Самалі. Плошча мацерыка 29,2 млн. *км*², з а-вамі 30,3 млн. *км*². Працягласць з Пн на Пд амаль 8000 *км*, з У на З у паўн. частцы каля 7500, у паўд. каля 3100 *км*. Астравоў мала. На У — Мадагаскар (самы вялікі), Занзібар, Сакотра, Каморскія, Маскарэнскія; на З — Канарскія, Зялёнага Мыса і інш. (карты гл. на ўкл.).

Рэльеф А. даволі аднастайны. У паўн. частцы выш. 200—500 *м*, на Пд ад 10° паўд. ш. 1000—2000 *м*. У межах Усх. Афрыкі пераважаюць вышыні каля 2000 *м*. Асобныя вулканічныя масівы дасягаюць 5000 *м* і больш. А. характэрны ступеньчатыя плато, сталовыя ўзвышшы і нагор'і (Эфіопскае, Ахакгар, Тыбесты і інш.), на якіх з вывергнутай лавы ўтварыліся базальтавыя покрывы. З прагінам фундаменту звязаны катлавіны: Калахары, Конга, Чад. На ПнЗ горы Атлас, на ПдУ — Драконавы горы. На фарміраванне рэльефу вялікі ўплыў зрабілі тэктанічныя рухі ў мезазойскую эру. Усх. ўскраіна ад Суэцкага заліва да р. Замбезі была раздроблена скідавымі ўпадзінамі, у якіх знаходзяцца Чырвонае м., пустыня Данакіль, азёры Усх. А. (акрамя воз. Вікторыя). Уздоўж ліній разломаў вулканічныя масівы: Кіліманджара (5895 *м* — найвышэйшы пункт А.), Кенія (5199 *м*) і інш.



Сахара. Аазісы ў Вялікім Усходнім Эрэе.

Геалагічная будова і карысныя выкапні. Амаль увесь мацярык А. з'яўляецца старажытнай платформай. Фундамент яе складзены з гнейсаў, крышталічных сланцаў і гранітаў. На Пн А. ён залягае на глыбіні да 10 *км* і перакрыты палеазойскімі, мезазойскімі і кайназойскімі, часткова чацвярцічнымі адкладамі. На Пд старадаўнія пароды выходзяць на паверхню і ўтвараюць Паўд.-Афрыканскі шчыт. На ПнЗ і Пд А. да платформы прымыкаюць горы *герцынскай складкавасці* (унутраны Атлас, Канскія). Паўн. схілы Атласкіх гор належаць да *альпійскай складкавасці*. Ва Усх. А. ў мезазойскую эру ў выніку магутных разломаў крышталічнага фундамента ўзнікла сістэма *грабенаў*, якая не мае аналогаў на інш. мацерыках.

Працягласць Усх.-Афрыканскіх грабенаў дасягае 1000 *км*, а амплітуда горставых падняццяў і апусканне грабенаў адпаведна да 3 і 2 *км*. Ва Усх. А. тры сістэмы грабенаў: заходняя, цэнтральная і ўсходняя. Зах. сістэма адпавядае даліне Ніла да гары Німуле, азёрам Альберт, Эдуард, Ківу, Танганьіка і праз упадзіну воз. Руква цягнецца да воз. Ньяса. Грабен падзяляе горставы масіў Рувензоры. На Пд у гарах Вірунга ёсць дзейныя вулканы (Ныра-Гонга і Ньямлагіра). Цэнтр. сістэма разломаў цягнецца ад воз. Рудольф на Пд праз азёры Барынга, Натран да грабена ракі Вял. Рваха. Усх. сістэма супадае з узбярэжжам Індыйскага ак. і абумоўлівае прамалінейнасць усх. ўзбярэжжа.

А. багатая на карысныя выкапні. Асн. мінер. багацці звязаны з дакембрыйскімі і кембрыйскімі пародамі (марганец, храміты, баксіты, золата, волава, азбест і інш.). З мезазойскімі ўтварэннямі звязаны алмазы, вугаль, фасфарыты, жалеза, свінцова-цынкавыя руды і інш. Найбольшыя ў зарубежным свеце радовішчы золата і урану — у Паўд.-Афр. Рэспубліцы, алмазаў — у Дэмакр. Рэспубліцы Конга і Паўд.-Афр. Рэспубліцы. Дэмакр. Рэспубліка Конга і Замбія багатыя на медзь, кобальт, цынк; Лівія, Алжыр, Нігерыя — на нафту; краіны Паўн. А. (Марока, Туніс і інш.) — на фасфарыты.

Клімат. А. размяшчаецца амаль сіметрычна ў адносінах да экватара, таму паўн. палова мала адрозніваецца кліматам ад паўднёвай. На Пн і Пд ад экватара вылучаюцца кліматычныя пасы: экватарыяльных мусонаў, трапічны і субтрапічны (міжземнаморскага тыпу). Геагр. месца А., слабы ўплыў акіяна і масіўнасць мацерыка абумоўліваюць пастаянна высокія тэмпературы паветра, асабліва ў Сахары.

А.— самы гарачы мацярык. Сумарная сонечная радыяцыя 180—200 *ккал*/*см*² за год. Асн. цыркуляцыйны працэс над А.— пасатны пераносканцінентальнага трапічнага паветра ў абодвух паўшар'ях да экватара. Тут яно трансфармуецца ў экватарыяльнае — у выніку моцнага выпарэння ўвільгатнілецца, а т-ра крыху паніжаецца, бо частка цеплавой энергіі расходуецца на выпарэнне. Сярэдняя т-ра студзеня ў Паўн. А. 12—20 °С, у Паўд. А., выключаючы высокія нагор'і, ад 20 да 25 °С і больш. На экватары заўсёды высокія т-ры (25—26 °С). Калі ў Паўн. паўшар'і зіма, акіянічныя цэнтры высокага атм. ціску — Азорскі, Паўд.-Атлантычны і Паўд.-Індыйскі — перамяшчаюцца на Пд. У Паўд. А. ўсталёўваецца нізкі атм. ціск, таму зімой паветраныя масы перамяшчаюцца в паўн. часткі мацерыка ў паўднёвую. Высокі атм. ціск над Сахарай не дае магчымасці выпадаць ападкам. З Сахары дзьмуць сухія гарачыя вятры, ад чаго ў суседнім Судане бывае сухая зіма. Калі ў паўн. паўшар'і лета, паветраныя масы ў асноўным перамяшчаюцца в Пд на Пн. Ліп. ізатэрма 20 °С праходзіць уздоўж паўночнага ўзбярэжжа, а 12 °С супадае з паўд. узбярэжжам. Асабліва моцна награецца Сахара (да 40 °С), у Лівійскай пустыні (ПнУ Сахары) т-ра дасягае 58 °С. Адсутнасць летніх ападкаў тлумачыцца выключнай сухасцю паветра. У пустынях Сахары, Калахары, Наміб (паўд.-зах. ўзбярэжжа А.) ападкаў за год да 100 *мм*; ва ўпадзіне Конга да 2000 *мм*; на ўсх. узбярэжжы ў паўд. частцы мацерыка — 750—1500 *мм*. Найбольш ападкаў (2000—3000 *мм*) выпадае на гарыстых участках узбярэжжа Гвінейскага заліва на Пн ад экватара; да 10 000 *мм* за год на наветраных схілах вулканічнага масіву Камерун. Ападкі на працягу года нераўнамерныя. У Судана-Гвінейскай краіне і на большай частцы Паўд. А. пераважаюць летнія дажджы з адным дажджлівым перыядам. На ўскраінах упадзіны Конга і на Эфіопскім нагор'і — летнія дажджы з двума дажджлівымі перыядамі, у цэнтр. частках Конга ападкі бываюць увесь год.


Гідраграфія. Асаблівасць А. — маладосць рачных сістэм і актыўная эрозія краявых падняццяў мацерыка і схілаў унутр. катлавін.

У асобныя эпохі чацвярцічнага перыяду А. мела больш густую сетку рэк. Вялікія азёры былі ў Сахары, Калахары і ва ўпадзіне Конга. З канца плейстацэну ўсталяваўся сучасны клімат, сухія сталі Сахара, Калахары і інш. раёны Афрыкі. Зніклі вялізныя азёры, часткова спушчаныя рэкамі (Конга), на месцы паўнаводных рэк асталіся сухія рэчышчы (вадзі).

На рэках А. шмат парогаў і вадаспадаў (найбольш магутныя вадаспады Вікторыя на р. Замбезі, Стэнлі і Лівінгстана на р. Конга), якія перашкаджаюць судаходству нават на вялікіх рэках (Ніл, Конга). Энергетычная каштоўнасць гэтых рэк вялікая (каля 20% сусв. гідраэнергарэсурсаў). Агульны гадавы сцёк рэк 5390 км³. 1/3 плошчы займаюць басейны 5 вялікіх рэк — Конга (самая паўнаводная і другая па даўжыні ў А.), Ніла (самая вялікая па даўжыні ў Афрыцы), Нігера, Замбезі, Аранжавай.

Азёры пайчасцей тэктанічнага паходжання, знаходзяцца пераважна ва Усх. А.: Альберт, Танганьіка, Ньяса, Рудольф і інш. Танганьіка па глыбіні (1435 м) займае 2-е месца ў свеце пасля Байкала. Воз. Вікторыя ў вялікім прагіне старадаўняга фундамента. Ёсць рэліктавыя азёры (Чад, Нгамі і інш.). На Эфіопскім нагор'і падпруджана лавай воз. Тана.

Глебы і расліннасць. У А. добра выяўляецца занальнасць глебава-расліннага покрыва. Вільготныя экватарыяльныя лясы (гілеі) растуць уздоўж узбярэжжа Гвінейскага заліва і ва ўпадзіне Конга. Лясы густыя, шматярусныя, з мноствам ліянаў і эпіфітаў, вельмі многа відаў (толькі дрэвавых каля 3000). Шмат каштоўных парод: чорнае дрэва, дрэва кола, віяная пальма, алейная пальма і інш. Пад гілеямі фарміруюцца ападзоленыя латарытныя глебы. Далей на Пн і Пд, у субэкватарыяльных і трапічных абласцях, дзе ўлетку выпадае многа ападкаў, чырвона-бурыя глебы саванаў і чырвона-карычневыя глебы ксерафітных рэдкалессяў. Саваны з рэдкалессем і хмызнякамі займаюць да 35% пл. кантынента. У трапічных пустынях (Сахара, Калаха-



Хаціна ў Заходняй Афрыцы (Гвінея).

ры) прымітыўныя глебы і вельмі рэдкая расліннасць з *ксерафітаў* і *сукулентаў*. Сахары характэрны бязлістыя злакі (дрын), паўхмызнякі (рэтам), тамарыкс. У саванах тыповыя злакі і асобныя вялікія дрэвы (баабаб), пальмы, акацыі. На крайнім ПнЗ, Пд і ПдЗ, у абласцях субтрапічнага клімату пераважна сухія лясы і хмызнякі тыпу маквіс на карычневых глебах. У А. 3712 родаў, 40 000 відаў раслін, у т. л. 900 эндэмічных трапічнай флоры. Асабліва многа *эндэмікаў* у паўд. частцы А., якая вылучаецца ў Капскую фларыстычную вобласць. На субтрапічных паўн. і паўд. ускраінах мацерыка зараснікі вечназялёных хмызнякоў на карычневых глебах.

Жывёльны свет А. багаты і разнастайны. У Паўн. А. і Сахары многа грызуноў, некалькі відаў антылоп (у т. л. газель звычайная), ёсць ліс фенек, шакалы, гіена паласатая. У Эфіопскай вобласці вузкапосыя малпы, шмат капытных і драпежнікаў, захаваўся афрыканскі страус. У гілеях чалавекападобныя малпы шымпанзэ, гарылы, карлікавы бегемот, акапі. З птушак — папугаі, галубы, цацаркі, птушка насарог. Шмат жукоў і матылёў. На Эфіопскім нагор'і і ва Усх. А. шматлікія траваедныя (жырафы, зебры, антылопы, буйвалы, сланы, бегемоты), драпежнікі (леў), сабакагаловыя малпы. З птушак — страус, чапля, нектарка. На Пд А., у асноўным пустынай і паўпустынай, водзяцца кафрскія даўганогі, падобныя на тушканчыкаў, антылопа-скакун, гіена, вівёры. У рэках кракадзілы. Шмат паўзуноў. З насякомых — тэрміты і муха цэцэ. Фаўна Мадагаскара вельмі старажытная і эндэмічная (тэнрэк — шчаціністы вожык, паўмалпы-лемуры, птушкі-бегуны). Жывёльны свет А. вельмі вышчаны, ахоўваецца ў некалькіх запаведніках (нацыянальных парках).


Прыродныя раёны. Па прыродных умовах А. падзяляецца на два падкантыненты — Нізкую і Высокую Афрыку. Нізкая Афрыка ўключае фізіка-геаграфічныя краіны: горы Атлас, Сахару, Судана-Гвінейскую краіну і ўпадзіну Конга, якая абмежавана краявымі падняццямі. У Высокую Афрыку ўваходзяць: Абесамалія (Эфіопскае нагор'е і п-аў Сама-

Савана ў Цэнтральнай Афрыцы.




Астравы Зялёнага мыса
Мора Сярэдзіземнае
Чорнае мора
Каспійскае мора
Чырвонае мора
Аравійскае мора
Мора Сахара
Мора Нубійскае пустыні
Мора Аравійскае пустыні
Мора Сірыйскае пустыні
Мора Ліўійскае пустыні
Мора Ніжнееўфратскае нізіны
Мора Верхнееўфратскае нізіны
Мора Месапатамскае нізіны
Мора Іранскага нагор'я
Мора Афганскага нагор'я
Мора Пустыні Руб-эль-Халі
Мора Аравійскага нагор'я
Мора Эфіопскага нагор'я
Мора Усходнеафрыканскага нагор'я
Мора Дэкана
Мора Гангскай нізіны
Мора Інда
Мора Цэнтральнаафрыканскага нагор'я
Мора Заходнеафрыканскага нагор'я
Мора Гвінейскага нагор'я
Мора Верхнегвінейскай нізіны
Мора Сенегамбійскай нізіны
Мора Верхнесенегальскага нагор'я
Мора Фута-Джалона
Мора Верхнегвінейскага нагор'я
Мора Нізкагвінейскага нагор'я
Мора Верхнеканга
Мора Сярэдняканга
Мора Нізкаканга
Мора Конга
Мора Заходнеконгскага нагор'я
Мора Верхнеконгскага нагор'я
Мора Сярэдняконгскага нагор'я
Мора Нізкаконгскага нагор'я
Мора Ангольскага нагор'я
Мора Верхнезамбійскага нагор'я
Мора Верхнезамбійскай нізіны
Мора Сярэднязамбійскага нагор'я
Мора Сярэднязамбійскай нізіны
Мора Нізказамбійскага нагор'я
Мора Нізкаафрыканскага нагор'я
Мора Капскага нагор'я
Мора Капскіх гор
Мора Драконавых гор
Мора Верхнеафрыканскага нагор'я
Мора Верхнеафрыканскай нізіны
Мора Сярэдняафрыканскага нагор'я
Мора Сярэдняафрыканскай нізіны
Мора Нізкаафрыканскай нізіны
Мора Эфіопскага нагор'я
Мора Сярэдняафрыканскага нагор'я
Мора Усходнеафрыканскага нагор'я
Мора Мадагаскара
Мора Цэнтральнага нагор'я
Мора Усходняга нагор'я
Мора Заходняга нагор'я
Мора Усходняй нізіны
Мора Заходняй нізіны
Мора Ніла
Мора Нубійскага нагор'я
Мора Ліўійскага нагор'я
Мора Ніжнееўфратскай нізіны
Мора Верхнееўфратскага нагор'я
Мора Месапатамскай

АФРЫКА, ТЭКТАНІЧНАЯ КАРТА




МАШТАБ 1:55 000 000

550 0 550 1100 1650 км

Карта надрукавана ў верасні 1969г.

АФРЫКА, ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА



МАШТАБ 1:55 000 000

550 0 550 1100 1650 км

Карта надрукавана ў верасні 1969г.





Дзяўчына з племені масаі ў Танзаніі (злева). Вадаспад Вікторыя на р. Замбезі.

лі), Усходняя Афрыка (самая высокая частка) і Паўд. Афрыка з в-вам Мадагаскар.

Насельніцтва. У А. жыве 336 млн. чал. (1968). А. насяляюць шматлікія плямёны і народнасці, якія ўтварыліся ў выніку перасялення абарыгенаў, пранікнення з Азіі арабаў і еўрап. каланізацыі. Шчыльнасць нас. ад 0,3 да 100 і больш чал. на 1 км² (у даліне і дэльце Ніла каля 550 чал. на 1 км²). Найбольшыя гарады: Каір, Александрыя, Касабланка, Алжыр, Лагас, Іаганесбург, Туніс, Адыс-Абеба, Акра, Кіншаса. Каля 80% нас. жыве ў вёсках і малых паселішчах з разнастайнымі будынкамі і планіроўкай.

Арабска-берберскае насельніцтва Паўн. А. займаецца земляробствам, у ААР пашыраны рамёствы (ткацтва, ганчарства), у бас. Ніла жывёлагадоўля, матычнае земляробства і рыбалоўства. Пігмеі, што жывуць невялікімі групамі ў джунглях у бас. рэк Конга, Уэле, займаюцца паляваннем, збіральніцтвам, насельніцтва Паўд. і Усх. А.— жывёлагадоўляй, паляваннем. Запятак большасці насельніцтва Цэнтр. А.— земляробства, паляванне, рыбная лоўля, гадоўля коз, авечак, свойскіх птушак. Гл. таксама *Народы Афрыкі*.

Палітычны падзел. Да 2-й сусв. вайны амаль усе краіны А. былі калоніямі Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, Партугаліі, Іспаніі. Існавалі толькі 3 фармальна незалежныя краіны: Егіпет, Ліберыя, Паўд.-Афр. Саюз (дамініён Вялікабрытаніі). У выніку вызв. барацьбы ў А. ўтварыліся 42 незалежныя дзяржавы (1970). На Пн арабскія краіны: ААР, Судан, Лівія, Туніс, Алжыр, Марока, Маўрытанія. У Зах. Афрыцы: Сенегал, Гамбія, Гвінея, Малі, Сьера-Леоне, Ліберыя, Берег Слановай Косці, Верхняя Вольта, Гана, Тога, Дагамея, Нігер, Нігерыя. Краіны Экватарыяльнай і Цэнтр. А.: Чад, Камерун, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка (ЦАР), Габон, Народная Рэспубліка Конга, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Экватарыяльная Гвінея. Краіны Усх. А.: Эфіопія, Самалі, Кенія, Уганда, Руанда, Бурундзі, Аб'яднаная Рэспубліка Танзанія. У паўд. А.: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (ПАР), Паўднёвая Радэзія (калонія Вялікабрытаніі); Намібія незаконна акупавана ПАР; Ангола і Мазамбік — партугальскія калоніі. Незалежнымі сталі Замбія, Малаві, Батсвана, Лесота, Свазіленд, на в-ве Мадагаскар — Малагасійская Рэспубліка, на в-ве Маўрыкій (з групы Маскарэнскіх а-воў) — Рэспубліка Маўрыкій. Каланіяльныя ўладанні, акрамя Паўд. А., захаваліся на ўзбярэжжах: Зах. Сахара, «Партугальская» Гвінея (Бісаў), франц. Самалі і драбнейшыя, пераважна на а-вах Індыйскага і Атлантычнага акіянаў. Народы ўсіх калоній вядуць барацьбу за вызваленне.

Літ.: Африка 1961—1965 гг. (Справочник), М., 1967; Александровская Н. В. и др. Физическая география частей света, М., 1963; Розин М. С. География полезных ископаемых Африки, М., 1957; Дмитревский Ю. Д. Внутренние воды Африки и их использование, Л., 1967; Мазарович А. Н. Основы региональной геологии материков, ч. 2, М., 1952; Тойт А. дю. Геология Южной Африки, пер. с англ., М., 1957; Народы Африки, М., 1954; Языки Африки, М., 1966; Антиимпериалистическая революция в Африке, М., 1967; Библиография Африки, М., 1964.

В. Р. Заўрыеў (фізічная геаграфія), *А. А. Мялешка* (насельніцтва). Мінск.


АФРЫКАНІСТЫКА, сукупнасць навук, якія вывучаюць гісторыю, эканоміку, этнаграфію, мову і л-ру народаў Афрыкі. Развіццё А. ў Расіі пачалося ў 30-я г. 17 ст. Для вывучэння народаў Афрыкі многа зрабілі Б. А. *Тураеў*, І. Ю. *Крачкоўскі*. Пасля Кастрасацыяліст. рэвалюцыі пачаўся новы этап у развіцці А. Сав. вучоныя падыходзяць да вывучэння гісторыі і культуры народаў Афрыкі з прынцыпова новых пазіцый, імкнуцца даследаваннямі садзейнічаць адраджэнню іх нац. культуры. У 1959 у сістэме АН СССР створаны спецыяльны НДІ Афрыкі. Разам з Ін-там Усходазнаўства выпускае час. «Народы Азии и Африки. История, экономика, культура» і «Азия и Африка сегодня».

АФРЫКАТЫ (лац. affrico прыціраю), зычныя, якія ўтвараюцца ад зліцця артыкуляцыі выбухнога і фрыкатыўнага гукаў. Напр., бел. А. складаюцца з аднатыпных паводле месца ўтварэння (пяраднеязычных) гукаў: «ц» («т+с»), «дз» («д+з»), «ч» («т+ш»), «дж» («д+ж»).

У працэсе артыкуляцыі А. услед за пачатковай змычкай органаў маўлення ўтвараецца шчыліна, праз яе без выбуху выходзіць паветра. Таму А. называюць яшчэ змычна-шчылінными зычнымі. Дзеляцца на звонкія («дз», «дж») і глухія («ц», «ч»).

АФСЕТНЫ ДРУК, від друку, калі адлюстраванне перадаецца з друкарскай формы на гумавую паверхню перадатачнага цыліндра, а з яго на паперу. Засн. на выбарачным намочванні друкавальных элементаў формы тлустай фарбай, прабелаў — вадой.

Друкарскія формы А. д. робяць на цынкавых або алюмініевых пласцінах, памеры якіх залежаць ад фармату талера (пліты) друкарскай машыны. Выкарыстоўваюцца таксама і больш трывалыя біметалічныя формы, у якіх друкавальныя элементы робяць на меднай паверхні, а прабельныя на нікелевай. Спосабам А. д. выконваюцца ўсе віды



кніжнай і выяўленчай прадукцыі. Друкаванне робіцца на афсетных друкарскіх машынах (плоскіх або ратацыйных).

АФТАЛЬМАЛАГІЧНЫЯ ПРЫЛАДЫ, медыцынскія прылады, з дапамогай якіх даследуюць вока і падбіраюць акулярную оптыку. Да А. п. адносяцца: афтальмаскоп, афтальмометр, апарат Рота, бінакулярная лупа, дыяптрыямер, вочныя магніты, перыметр, рэфрактометр і шчылінная лямпа.

Афтальмаскоп — люстэрка з адтулінай у цэнтры, мае даве лінзы ў 13 і 20 дыяптрый. Служыць пры аглядзе вонкавых і ўнутр. частак вока. Эл. афтальмаскоп мае сваю асвятляльную сістэму і дыск з наборам карыгавальных лінзаў; ім вызначаюць рэфракцыю вока. Афтальмометр — зрокавая труба, з дапамогай якой выяўляюць і вымяраюць *астыгматызм* вока; неабходны пры падборы акуляраў. Апарат Рота — асвятляльнае прыстасаванне да табліцы зроку. Бінакулярная лупа прызначаецца для агляду вонкавых частак вока. Дыяптрыямер — прылада, якою вымяраюць пераламляльную сілу акулярнага шкла. Вочныя магніты — цыліндры, якія пераходзяць у конус. Ужываюцца, калі трэба выдаліць магнітныя часцінкі з вока. Перыметр — прыстасаванне, з дапамогай якога вымяраюць поле зроку. Мае выгляд дугі з адзнакай 0° у цэнтры і 90° на краях. Па дузе перамяшчаюць стандартныя аб'екты і выяўляюць межы поля зроку. Рэфрактометр — апарат аб'ектыўнага вымярэння пераламляльнай сілы вока, а пры наяўнасці астыгматызму — выяўлення галоўных аптычных восяў. Шчылінная лямпа — бінакулярны мікраскоп, якім даследуюць пярэдні адрэзак і дно вока. *А. А. Ільюшэнка.* Мінск.

АФТАЛЬМАЛО́ГІЯ (грэч. ophthalmos вока+...*логія*), навука пра вока і яго хваробы. Афтальмалагічныя даследаванні шырока выкарыстоўваюцца ў неўралогіі, нейрахірургіі, тэрапіі і інш.

Першыя звесткі пра хваробы вачэй сустракаюцца ў стараж.-егіп. пісьмовых помніках. У працах Гіпакрата (5—4 ст. да н. э.) ёсць апісанне вока і некат. яго хвароб. Як самастойная навука А. пачала фарміравацца ў 17 ст. ў сувязі з развіццём оптыкі. Развіццю А. спрыяла вынаходства Г. Гельмгольцам вочнага люстэрка (афтальмаскопа, 1851). У Расіі ў 1818 заснавана першая кафедра вочных хвароб, у 1824 Пецярбургская вочная лячэбніца, у 1826 Маскоўская вочная бальніца. Значны ўклад у А. зрабілі рус. вучоныя А. У. Іваноў, А. А. Крукаў, А. М. Маклакаў, Л. Г. Белярмінаў, М. І. Авербах, В. П. Адзінцоў, У. П. Філатаў (першы ў свеце распрацаваў даступны ўсім афтальмахірургам метад перасадкі рагавіцы). Пасля Кастр. рэв. ў СССР амаль ліквідаваны трахома, пытанні ранняй дыягностыкі і лячэння глаўкомы, прафілактыкі прамысл. і с.-г. траўматызму вачэй, удасканальваюцца тэхніка хірург. лячэння і метады даследавання вока (біямікраскапія, рэнтгеналогія ў Маскве, Ленінградзе, Адэсе. Афтальмолагі СССР аб'яднаны ў навук. т-ва, праводзяцца з'езды і канферэнцыі. Выдаюцца час.: «Вестник офтальмологии», «Офтальмологический журнал».

У БССР першая кафедра вочных хвароб адкрыта на мед. ф-це БДУ ў 1923. На 1.1.1969 у рэспубліцы было 4 кафедры — у мед. ВНУ і ў Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў. У гэты час працавалі 493 афтальмолагі, было 944 спецыялізаваныя бальнічныя ложкі. У рэспубліцы ёсць навук. т-ва афтальмолагаў. Бел. афтальмолагі распрацоўваюць пытанні дыягностыкі і лячэння туберкулёзу вачэй, аховы зроку ў дзяцей, хірургічных метадаў лячэння і інш.

Літ.: Удинцов Е. И. Успехи отечественной офтальмологии и профилактика глазных заболеваний, М., 1966; Крючок Т. И. Развитие офтальмологии в Белоруссии (конец XVIII в.— 1958 г.), Рига, 1961 (Аўтарэф. дыс.); Золотарева М. М. Глазные болезни, Мн., 1964; Плетнева И. А. Глазные болезни, 2 изд., М., 1956; Архангельский В. Н., Вряцева М. К. и Дермидонтова К. В. Учебник глазных болезней, М., 1963. *Т. В. Бірыч, Т. І. Кручок.* Мінск.

АХАЛТЭКІ́НСКАЯ парода коней, старажытная верхавая парода, выведзеная шматвяковым адборам ва ўмовах гарачага сухога клімату Туркменіі. Гадуюць у Туркменскай, Казахскай, Узбекскай, Кіргізскай ССР, а таксама ў РСФСР.

Коні гэтай пароды маюць прыгожы сухі склад цела, лёгкую галаву, доўгую тонкую шыю, высокі карак, прадаўгаватую спіну, тонкія доўгія ногі, эластычную скуру, шаўкавістую поўсць. Сярэднія прамеры жарабцоў (у см): вышыня ў карку 154, касая даўжыня тулава 158, абхват грудзей 167, пясці 19. Масць буланая, вараная, шэрая, гнядая, слівыя. Яны выкарыстоўваліся для вывядзення верхавых парод у нашай краіне і за мяжой, для паляпшэння мясн. коней у раёнах верхавой конегадоўлі. *Л. Х. Зуйкоў.* Горкі Магілёўскай вобл.

АХВЕ́РДАЎ Абдурагім бек Асадбек аглы (17.5.1870, г. Шуша — 11.12.1933), азербайджанскі савецкі пісьменнік. Засл. дз. маст. Азерб. ССР (1928). Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. Літ. дзейнасць пачаў камедыяй «З'еш гусінага мяса — пазнаеш яго смак» (1892). Крызіс дваранскай сям'і паказаў у трагедыі «Раскіданае гняздо» (1896). У п'есе «Няшчасны юнак» (1900) стварыў вобраз змагара за волю і шчасце народа. З 1906 актыўна друкаваўся ў час. «Мала Насрэдзін». Вядомы прадстаўнік азерб. рэаліст. прозы 20 ст. У сатыр. аповесці «Пісьмы з пекла», цыкле апавяд. «Мае алені», у апавяд. «Шэйх Шабан» высмейвае феад.-бурж. парадкі, з сімпатыяй малюе вобразы простых людзей. Пры Сав. уладзе напісаў шэраг п'ес («Старое пакаленне», «У цяні дрэва»), нарыс «З гісторыі азербайджанскага тэатра» (1924), манаграфію «Жыццё і творчасць М. Ф. Ахундава» (1928) і інш.

Тв.: Рус. пер.— Письма из ада. Избранные произведения, М., 1960.

Літ.: Мамедов К., А. Ахвердов, Баку, 1959.

АХВЕ́РДАЎ Іосіф Мікалаевіч [н. 15(28).1916, г. Тыфліс], беларускі вучоны ў галіне будаўніцтва. Чл.-кар. АН БССР (1960). Праф. (1962), заг. кафедры Беларускага політэхн. ін-та, кіраўнік лабараторыі «Фізічныя асновы тэхналогіі бетону» Ін-та буд-ва і архітэктуры Дзяржбуда БССР. Працы А. па тэхналогіі бетону, аптымальным рэжыме вырабу напорных і безнапорных жалезабетонных труб. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Возведение каменных сооружений из раздельной бутовой кладки, М., 1952; Легкий бетон, М., 1955; (разам з І. М. Авадоўскім і В. А. Тумашэвіч) Напряженно армированные плиты-настилы в строительстве, М., 1956; Высокопрочный бетон, М., 1961; Новый метод проектирования состава бетона с учетом его структурных и технологических особенностей, Мн., 1961; Железобетонные напорные центрифугированные трубы, М., 1967; (разам з М. А. Шаліма) Ультразвуковое вибрирование в технологии бетона, М., 1969.

АХВЯРАПРЫНАШЭ́ННЕ, старадаўні рэлігійны абрад прынашэння дароў духам продкаў, багам, святым.

Узнікла ў эпоху першабытнаабшчыннага ладу, было неад'емнай часткай ранніх формаў рэлігіі. Мела на мэце задобрыць духаў ці багоў па прынцыпе: «даю, каб ты даў». А. рабілася перад пачаткам і ў канцы палявання, падарожжа, вайны, калі нараджалася дзіця, з выпадку цяжкай хваробы і г. д. З узнікненнем *жрацтва* жрацы прысвойвалі ахвярныя дары (прадукты земляробства, жывёлагадоўлі, маёмасць, зямлю і г. д.) і таму ўсімі сіламі падтрымлівалі веру ў магічную сілу А. У перыяд хрысціянства ахвяры веруючых спрыялі росту эканам. магутнасці царквы, асабліва каталіцкай. У старажытнасці ў ахвяру багам часта прыносілі людзей. Як адгалосак таго часу ў 1-й кнізе Бібліі ёсць расказ пра спробу Аўрама прынесці сына Ісаака ў ахвяру богу («Быццё», 22). Неражытак А. ў хрысціянстве — курэнне фіміяму, запальванне свечак, лампад. На Беларусі веруючыя маюць звычай класці перад абразамі, статуямі багоў і «святых» прадукты, вылепленыя з воску часткі чалавечага цела, фігуркі людзей, жывёл. Звычай А. падтрымлівае ў веруючых ілюзорныя спадзяванні на звышнатуральную дапамогу ў цяжкіх абставінах жыцця і тым самым скуўвае іх сілы ў барацьбе з гэтымі цяжкасцямі. *Дз. М. Мацяс.* Мінск.

АХЕ́ЙСКІ САЮ́З, палітычнае аб'яднанне старажытнагрэчаскіх полісаў Пелапанеса, створанае каля 280 да н. э. для барацьбы з *Македоніяй* і *Этолійскім саюзам* за гегемонію ў Грэцыі.

У 2-й пал. 3 ст. да н. э. ў А. с. уваходзіла каля 60 полісаў, з іх самыя вялікія Аргас, Карынф, Сікіён і інш. Адстойваў інтарэсы рабаўладальніцкай арыстакратыі. У А. с. было агульнасаюзнае грамадзянства, адзіная сістэма мер і вагі. Вышэйшым органам улады з'яўляўся саюзны сход. На чале выканаўчай улады стаяў стратэг. У 221 да н. э. саюз падпаў пад уплыў Македоніі. Пасля 2-й Македонскай вайны (200—197 да н. э.) алігархі А. с. сталі арыентавацца на Рым. Узмацненне рым. ўплыву ў Грэцыі выклікала антырым. паўстанне ў А. с., якое было задушана ў 146 да н. э. Тэр. А. с. ператворана ў рым. правінцыю.

АХЕМЕНІ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, старажытнаперсідская рабаўладальніцкая дзяржава на тэрыторыі Ірана і інш. азіяцкіх краін (ад р. Інда да Эгейскага і Міжземнага мораў), а таксама Егіпта, часткі Лівіі і Балканскага п-ва. Існавала з сярэдзіны 6 ст. да 330 да н. э.

Заснавальнік — Кір II [550—530 да н. э.], прадстаўнік старажытнаперс. роду Ахеменідаў. Па этнічным і сацыяльным укладзе яна была неаднароднай, не мела ўстойлівай эканам. базы, была нетрывалым ваенна-адм. аб'яднаннем. Нар. рух, частыя паўстанні ў заваяваных краінах падарвалі магутнасць А. дз. Пасля некалькіх паражэнняў ад арміі Аляксандра Македонскага распалася.

АХІ́Л, Ахілес (Achilléus), у грэчаскай міфалогіі герой Траянскай вайны; адна з галоўных дзейных асоб паэмы *Гамера* «Іліяда». Паводле падання марская багіня Фетыда — маці А.— акунула яго дзіцем у святую раку Стыкс. Ад гэтага цела А. зрабілася непаражальным, акрамя пяткі, за якую багіня трымала сына. А. і загінуў ад стралы, што папала ў пяту (адсюль «ахілесава пята», г. зн. паражальнае, слабое месца).

АХЛО́ПКАЎ Мікалай Паўлавіч [2(15).5.1900, Іркуцк — 8.1.1967], рускі савецкі акцёр, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1948). Чл. КПСС з 1952. Сцэнічную дзейнасць пачаў у 1918 у Іркуцку. У 1930—37 узначальваў Рэалістычны т-р, у 1938—43 рэж. і акцёр т-ра імя Вахтангава. З 1943 гал. рэж. т-ра Рэвалюцыі (т-р імя Маякоўскага). Пастаноўкі: «Арыстакраты» М. Пагодзіна (1935), «Маладая гвардыя» па рамане А. Фадзеева (1947), «Гамлет» У. Шэкспіра (1954), «Іркуцкая гісторыя» А. Арбузава (1960), «Медэя» Еўрыпіда (1961) і інш. Спектаклі А. вызначаюцца яркай тэатральнасцю, публіцыстычнасцю, манументальнасцю, шырокім выкарыстаннем умоўнасці, сінтэтычных сродкаў выразнасці, пошукамі новых тэатр. формаў. А.— аўтар артыкулаў па праблемах тэатр. мастацтва. З 1924 здымаўся ў кіно («Ленін у 1918», «Аляксандр Неўскі» і інш.). Дзярж. прэміі СССР 1941, 1947, 1949 (дзве), 1951 (дзве). Узнагароджаны ордэнам Леніна і 3 інш. ордэнамі.



АХЛО́ПКАЎ Фёдар Мацвеевіч [17.2(1.3). 1908, Баягантайскі наслег 3-і Якуцкай вобл.— 29.5.1968], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). Чл. КПСС з 1941. Да вайны — паляўнічы, золатаздабытчык. У 1941—44 на фронце, снайпер; знішчыў 429 фашыстаў. Удзельнік баёў пад Масквой, за вызваленне Калінінскай, Смаленскай, Віцебскай абл. Дэп. Вярх. Сав. СССР 2-га скл. Саўгас на радзіме А. названы яго імем.

АХМАДАБА́Д, горад на захадзе Індыі, адм. ц. штата Гуджарат. 1,3 млн. ж. (1967). Вузел чыг. і шашэйных дарог. Аэрапорт. Буйны цэнтр тэкст. прамысл. Хім., харч., гарбарныя, запалкавыя і інш. прадпрыемствы. Ручное прадзіва і ткацтва. Саматужныя вырабы з металу, дрэва, слановай косці. Ун-т з 1949. Гістарычныя помнікі сярэдневяковай мусульманскай культуры.

АХМА́Д-ША́Х ДУРА́НІ (каля 1721—1773), шах Афганістана [1747—73], заснавальнік незалежнай афганскай дзяржавы. З 1738 служыў у войску іранскага шаха Надзіра і паказаў вялікія ваенныя здольнасці. Пасля смерці Надзір-шаха ўзначаліў афг. атрады іранскага войска і павёў іх у Афганістан, дзе ў 1747 абвешчаны шахам. А.-ш. Д. аб'яднаў пад сваёй уладай усе афг. плямёны і заснаваў т. зв. Дуранійскую дзяржаву. Заваяваў вял. землі ў Індыі, Іране, за Гіндукушам. Да часу праўлення А.-ш. Д. адносяцца першыя дружалюбныя кантакты паміж Афганістанам і Расіяй.

Літ.: Губар М. Г. М. Ахмад-шах — основатель афганского государства, пер. с перс., М., 1959.

АХМА́НСКІ (Ochmański) Ежы (н. 4.12. 1933), польскі гісторык, даследчык гісторыі Беларусі і Літвы. У 1955 скончыў Познанскі ун-т, з 1959 працуе ў гэтым ун-це выкладчыкам на кафедры гісторыі народаў СССР. Д-р гістар. навук (1964). Аўтар манаграфій і артыкулаў, прысвечаных гал. ч. сацыяльна-эканам. гісторыі Беларусі і Літвы 14—19 ст.

Тв.: Gospodarka folwarczna w dobrach hospodarskich na Kobryńszczyźnie. Studium z dziejów folwarku na Białorusi, koniec XV — pocz. XVII w., «Kwartalnik Historii Kultury Materialnej», Warszawa, 1958, № 3; Położenie społeczno-gospodarcze i walka klasowa chłopów w ekonomii Kobryńskiej w drugiej połowie XVI i pierwszej połowie XVII w., «Roczniki Dziejów Społecznych i Gospodarczych», Poznań, 1958, t. 19; Powstanie i rozwój latyfundium Biskupstwa wileńskiego (1387—1550). Ze studiów nad rozwojem wielkiej własności na Litwie i Białorusi w średniowieczu, Poznań, 1963; Litewski ruch narodowo-kulturalny w XIX w. (do 1890), Białystok, 1965.

АХМА́ТАВА (сапр. Гаранка) Ганна Андрэеўна [11(23).6.1889, пас. Вялікі Фантан пад Адэсай — 5.3.1966], руская савецкая паэтэса. З сям'і інж.-механіка флоту. Друкавацца пачала ў 1907.



У зб. «Вечар» (1912), «Ружанец» (1914), «Белая чарада» (1917) выступіла як прадстаўніца *акмеізму*. Зб. «Трыпутнік» (1921) і «Anno Domini MCMXXI» (1921) паказваюць разлад А. з рэвалюц. эпохай, аднак паэтэса не пайшла за белаэмігрантамі («Калі ў смутку самагубства...»). Пасля доўгага перапынку напісала цыкл «Вярба» (1940), дзе стараецца пераадолець адзіноту. У 40-я г. піша ліра-эпічныя творы на гістар. тэмы (цыкл «У саракавым годзе», паэма «Шляхам усёй зямлі», «1913 год» — 1-я ч. «Паэмы без героя»). Вершы 1941—45 (цыкл «Вецер вайны») прасякнуты трывогай за лёс Радзімы, пяпавісцю да фашызму («Клятва», 1941; «Мужнасць», 1942). У 50—60-я г. ў творчасці А. паглыбляюцца гістор.-філас. і інтымна-лірычныя тэмы. Прызванне паэта для яе — перадаць веліч і трагізм чалавечага лёсу (цыкл «Тайны рамяства», 2-я і 3-я ч. «Паэмы без героя»). Творы паэтэсы вызначаюцца выразнасцю і дакладнасцю слова, класічнай прастатой і яснасцю стылю. Аўтар паэтычных перакладаў, літ.-знаўчых прац («Апошняя казка Пушкіна», «Гібель Пушкіна»). Пераклала вершы У. Дубоўкі «Пальцы жоўтых пяляновых лістоў» і «Думкі лятуць».

Тв.: У самого моря, П., 1921; Из шести книг, Л., 1940; Стихотворения (1909—1960), М., 1961 [з аўтабіягр.]; Бег времени. Стихотворения. 1909—1965, М.—Л., 1965; Голоса поэтов. Стихи зарубежных поэтов в пер. А. Ахматовой, М., 1965; Стихотворения, М., 1967.

Літ.: Павловский А. И. Анна Ахматова. Очерк творчества, Л., 1966; Озеров Л. Тайны ремесла, у яго кн.: Работа поэта, М., 1963; Добин Е. Поэзия Анны Ахматовой, Л., 1968.

АХМЕ́ДАЎ Джаміл Магамед аглы (1924, мяст. Джэбраіл Азерб. ССР — 6.10.1944), удзельнік бабў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942. Вызначыўся пры вызваленні Бел. Палесся. Стралковы ўзвод А. 25.6.1944 прарваў участак абароны ворага каля в. Пружынішча Парыцкага р-на Гомельскай вобл., фарсіраваў р. Трэмлю і авалодаў варожымі ўмацаваннямі каля в. Малынь Акцябрскага р-на. Загінуў у Польшчы. У Джэбраіле ўстаноўлены бюст А., вуліца і школа названы яго імем.

АХМЕДАЎ Фатула (19.4.1918, кішлак Унджы Хаджынцкага пав. — 30.7.1944), удзельнік бабў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1941; камандзір узвода процітанкавага ружжа (ПТР). Вызначыўся каля в. Перадрэйка Петрыкаўскага р-на Палескай вобл. У час атакі праціўніка 12.2.1944 А. падпаліў галаўны варожы танк, і атака гітлераўцаў была спынена. Загінуў у Польшчы. У кішлаку Кулангір устаноўлены бюст А.

АХМЕТЭЛІ Аляксандр (Сандро) Васілевіч [13(25).4.1886, с. Анага, Грузія — 29.6.1937], грузінскі савецкі рэжысёр. Адзін з заснавальнікаў груз. сав. т-ра. Нар. арт. Груз. ССР (1933). У 1920 пачаў прафесіян. дзейнасць. У 1926—35 маст. кіраўнік т-ра імя Руставелі (Тбілісі). Сцвярджаў эстэтычныя ідэалы гераічнага т-ра. Яркая тэатральнасць, пан. каларыт, эладжанасць акцёрскага ансамбля, графічна дакладныя і жывапісныя масавыя сцэны, імкненне да маштабнасці вызначалі пастаноўкі А. Лепшыя: «Загмук» А. Глебава (1926), «Разлом» Б. Лаўранёва (1928), «Анзор» С. Шаншыяшвілі (1928), «Ламара» па матывах тв. Важа Пшавелы (1930), «Разбойнікі» Ф. Шылера (1933). *В. П. Кікнадзе.* Тбілісі.

АХО́ВА АБСТАЛЯВА́ННЯ аўтаматычная, сукупнасць прылад, прыстасаванняў і сістэм аўтаматыкі, якія засцерагаюць абсталяванне ад пашкоджання. Пры парушэнні нармальнага рэжыму работы (павышэнне ціску, т-ры, узроўню вадкасці, напружання і сілы эл. току і інш.) аўтаматычна ліквідуюцца непаладкі або адключаецца частка абсталявання ці спыняецца яго работа. Пры гэтым з дапамогай сігналізацыі каманда падаецца на дыспетчарскі пункт, каб папярэдзіць абслуговы персанал. Простыя прыстасаванні (напр., плаўкія засцерагальнікі, клапаны ціску), складаныя схемы і канструкцыі А. а. ўжываюцца ў розных галінах нар. гасп. У энергетыцы А. а. выдзелілася ў асобную галіну тэхнікі — *рэлейную ахову*. Гл. таксама *Ахоўны электрычны аўтамат, Разраднік*.

АХО́ВА АД ВЫПРАМЯНЕ́ННЯЎ, абсталяванне ці комплекс збудаванняў, якія памяншаюць радыеактыўнае выпрамяненне да ўзроўню, бяспечнага для чалавека (біялагічная ахова) і нармальнай работы апаратаў. Выбар матэрыялу для аховы залежыць ад тыпу і магутнасці радыеактыўнай крыніцы. Ахова ад рэнтгенаўскага і γ-выпрамянення дасягаецца выкарыстаннем матэрыялаў з вялікім атамным нумарам (напр., жалеза, свінец), а таксама вады, пяску, бетону. Скорыя нейтроны спачатку замаруджваюцца атамамі цяжкіх элементаў (напр., свінец, барый), а потым вадой, бетонам, графітам. Павольныя нейтроны паглынаюцца борам, кадміем, літыем. Цяжкія элементы адначасова паглынаюць γ-выпрамяненне, якое ўзнікае пры замаруджванні і паглынанні скорых нейтронаў. Ахову ад β-выпрамянення робяць з матэрыялаў, якія маюць малую ат. м. (напр., алюмінію); пры вялікай актыўнасці крыніцы дадаткова ўстанаўліваюць свінцовы экран. Ад α-выпрамянення ахоўвае экран з некалькіх аркушаў паперы. *Л. П. Рагінец.* Мінск.

АХО́ВА ЗДАРО́ЎЯ, комплекс дзяржаўных і грамадскіх мерапрыемстваў, накіраваных на зберажэнне і паляпшэнне здароўя насельніцтва, на папярэджанне хвароб і на іх лячэнне. Змест, характар і аб'ём мерапрыемстваў па А. з. вызначаюцца грамадскім ладам, узроўнем развіцця навукі, тэхнікі, культуры. Пры капіталізме А. з. падпарадкавана эксплуатацыі. Капіталізм — вораг здароўя працоўных, марнатраўца людзей, жывой працы, марнатраўца не толькі цела і крыві, але нерваў і мозгу (гл. Маркс К. Капітал, т. 3, Мн., 1953, с. 92). У эпоху імперыялізму з дапамогай т. зв. «навуковых сістэм» арганізацыі працы і кіравання капіталісты з рабочага «высмоктваюць з патроенай хуткасцю кожную кроплю нервовай і мускульнай энергіі...» (Ленін У. І. Тв., т. 18, с. 556). Хранічнае беспрацоўе, дарагоўля жыцця, перыядычныя эканам. крызісы асуджаюць працоўных на голад, жабрацтва, вядуць да масавых захворванняў і высокай смяротнасці.

А. з. ў СССР — сістэма дзярж. і грамадскіх мерапрыемстваў, якія накіраваны на папярэджанне і лячэнне хвароб, забеспячэнне здаровых умоў працы і быту з мэтай усебаковага і гарманічнага развіцця фіз. і духоўных сіл, павышэння працаздольнасці, прадаўжэння жыцця ўсіх членаў гр-ва. Савецкая А. з. заснавана на прынцыпе бясплатнасці і даступнасці для ўсіх працоўных кваліфікаванай мед. дапамогі, што забяспечваецца шырокай сеткай ляч.-прафілакт. і сан. устаноў у гарадах і вёсках. Уся сістэма мерапрыемстваў А. з. ажыццяўляецца па сродкі дзяржавы. Сацыяліст. А. з. мае прафілакт. кірунак і планавы характар, цесна звязана з перадавой навукай і тэхнікай. Да функцый органаў А. з. ў СССР адносяцца:



Хірургічная аперацыя ў 1-й клінічнай бальніцы г. Мінска.


лячэбна-прафілакт. дапамогі пасельніцтву, санітарна-процізпідэміялагічнае яго абслугоўванне, арганізацыя курортнай справы і санітарнай асветы, арганізацыя аптэчнай справы, а таксама ахова здароўя маці і дзіцяці, якой партыя і Сав. ўрад надаюць асаблівую ўвагу (гл. *Ахова мацярынства і дзяцінства*).

19 снежня 1969 прыняты Асновы заканадаўства СССР і саюзных рэспублік аб ахове здароўя. У іх заканадаўча замацаваны функцыі дзяржавы, мясцовых органаў улады, кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый па ахове здароўя насельніцтва, забеспячэнні сан.-эпідэмічнага дабрабыту яго, мацярынства, дзяцінства і інш.

Лячэбна-прафілактычная дапамога ажыццяўляецца праз *паліклінікі, амбулаторыі, бальніцы, дыспансеры*, кансультацыі і службы хуткай і неадкладнай дапамогі. На вялікіх прадпрыемствах выкарыстоўваецца прынцып цэхавай участковасці, які дазваляе ўлічваць асаблівасці вытв., ажыццяўляць пастаянны кантроль за здароўем рабочых (гл. *Дыспансерызацыя*) і ўмовамі працы (гл. *Медыка-санітарная частка*). Асн. ляч.-прафілакт. ўстановамі на вёсцы з'яўляюцца ўчастковая і раённая бальніцы, на ўчастках арганізоўваюцца фельч.-ак. пункты. У абл. цэнтрах створаны абл. бальніцы, якія ажыццяўляюць спецыялізаваную ляч.-прафілакт. дапамогу хворым, накіраваным раённымі бальніцамі, метадычную дапамогу ўрачам раённых і ўчастковых бальніц, праводзяць удасканаленне і спецыялізацыю ўрачоў. Для хуткай і неадкладнай дапамогі на перыферыі пры абл. бальніцах ёсць санітарная авіяцыя.

На аснове агульнага развіцця сацыяліст. эканомікі за гады Сав. улады БССР перагнала развітыя капіталіст. краіны па колькасці ўрачоў на 10 тыс. насельніцтва (БССР — 23,9; ЗША — 18,6; Вялікабрытанія — 14,7; Францыя — 15,4). У параўнанні з дарэвалюц. часам колькасць урачоў у БССР павялічылася амаль у 18 разоў і на пач. 1969 дасягнула 21 281, сярэдніх мед. работнікаў 66 037. Няспынна растуць асігнаванні на А. з. і фіз-

Прамянёвая тэрапія злаякасных пухлін у НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі (в. Бараўляны Мінскага раёна).





Абмеркаванне рэнтгенаграмы ў шпітальнай хірургічнай клініцы Віцебскага медыцынскага інстытута [прафесар І. В. Аляшкевіч (злева) і дацэнт Г. Ф. Катовіч].

культуру. У 1940 яны склалі 4 руб. на 1 жыхара, у 1969 — 29,95 руб. Рэзкае павелічэнне колькасці аптэк (з 297 у 1913 да 1085 у 1969) дазволіла забяспечыць даступнасць лекавай дапамогі насельніцтву. Акрамя аптэк, у 1969 працавала 3141 аптэчны пункт і кіёск. За гады Сав. улады ў БССР створана сістэма падрыхтоўкі кадраў і павышэння іх кваліфікацыі. У 1921 пры БДУ адкрыты мед. ф-т, які ў 1930 быў ператвораны ў мед. ін-т. У 1934 адкрыты мед. ін-т у Віцебску, у 1958 у Гродне. У 1969 мед. ін-ты рэспублікі выпусцілі 1223 урачоў і 97 фармацэўтаў. Рыхтуюць урачоў па 4 профілях (лячэбны, сан.-гігіенічны, педыятрычны, стаматалагічны), у Віцебскім мед. ін-це ёсць фармакалагічны ф-т. Працуе Бел. ін-т удасканалення ўрачоў. Для падрыхтоўкі сярэдніх мед. кадраў у рэсп. ёсць 22 мед. вучылішчы. Удасканаленне ажыццяўляецца ў 2 вучылішчах. У 1969 выпушчана сярэдніх мед. работнікаў 5754 чал. Для распрацоўкі навук.-практычных і тэарэтычных пытанняў А. з. ў БССР створана 10 НДІ. У сістэме А. з. на 1.1.1970 працавала 88 дактароў і 759 канд. навук, усяго 1539 навукова-пед. работнікаў. Няспынны рост матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню і паляпшэнне мед. абслугоўвання дазволілі ліквідаваць шэраг небяспечных інфекцыйных хвароб. У параўнанні з 1913 смяротнасць насельніцтва Беларусі ў 1968 паменшылася ў 3,6 раза, а ў параўнанні з 1940 амаль у 2 разы. Дзіцячая смяротнасць у 1968 у параўнанні з 1940 паменшылася ў 6,1 раза і склала 19,9 на 1000 народжаных. Сярэдняя працягласць будучага жыцця павялічылася ў параўнанні з 1926—27 амаль у 1,5 раза і склала 73 гады.

Рабочым і служачым у выпадку хваробы, пры часовай непрацаздольнасці ад траўмы ці прафесіян. хваробы, акрамя бясплатнай мед. дапамогі, выдаецца дапамога памерам да 100% заработнай платы. У СССР законам замацавана права працоўных на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці, створана ўстойлівая гарантаваная сістэма пенсійнага забеспячэння працоўных. У дарэвалюц. Беларусі дзярж. пенсійным забеспячэннем карысталіся толькі вайскоўцы і чыноўнікі. Гл. таксама *Сацыяльнае забеспячэнне* і *Сацыяльнае страхаванне*.

Санітарна-прафілактычнае абслугоўванне ажыццяўляецца органамі А. з., якія распрацоўваюць адпаведныя гігіенічныя нарматывы і кантралююць іх выкананне шляхам папераджальнага і бягучага сан. нагляду, а таксама выкананне спец. мерапрыемстваў, каб папярэдзіць эпідэмічныя і інш. масавыя хваробы. Гэтыя функцыі ажыццяўляе *санітарна-эпідэміялагічная служба СССР* на чале з Галоўным санітарна-эпідэміялаг. упраўленнем Мін-ва аховы здароўя СССР. Мерапрыемствы, накіраваныя на добраўпарадкаванне нас. пунктаў, ажыццяўляюць органы камунальнай гаспадаркі. Ахова працы і тэхніка бяспекі, забеспячэнне чысціні і сан. парадку на прадпр. і ва ўстановах — абавязак адміністрацыі і прафсаюзаў.

Санаторна-курортная дапамога. У санаторыях і дамах адпачынку СССР штогод лечацца і адпачываюць больш як 5 млн. працоўных (у дарэвалюц. Расіі было 36 курортаў і 60 санаторыяў). Санаторыі з'яўляюцца спецыялізаванымі ляч.-прафілакт. ўстановамі для лячэння туберкулёзу, сардэчна-сасудзістых, страўнікава-кішачных, нервовых і інш. хвароб. Гл. таксама *Курорты*.

Санітарная асвета — усеагульны метад мед. работы, незалежна ад характару дзейнасці ўрача і яго спецыяльнасці. Арганізацыйна-метадыч. кіраўніцтва сан. асветай ажыццяўляюць Дамы санітарнай асветы. Шмат памагае органам А. з. ў правядзенні масавых мерапрыемстваў, умацаванні сан. абароны Саюз таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца.

Аптэчная справа. У дарэвалюц. Расіі на адну аптэку прыпадала 10,8 тыс. жыхароў у гарадах і 119,5 тыс. у паветах. За гады Сав. улады створана шырокая сетка аптэк і аптэчных пунктаў (каля 130 тыс.). Колькасць фармацэўтаў павялічылася больш чым у 11 разоў.

Літ.: Пашинцев П. А., К. Маркс и Ф. Энгельс о социальных основах здравоохранения, М., 1952; Добровольский Ю. А. Здоровье населения мира в XX веке, М., 1968; Граченков Н. И. и Лисицын Ю. П. Здравоохранение в СССР и достижения советской медицины, М., 1958; Организация здравоохранения в СССР, под ред. Н. А. Виноградова, 2 изд., М., 1962; 50 лет советского здравоохранения. 1917—1967, М., 1967; Семашко Н. А. Избранные произведения, 2 изд., М., 1967. *М. Я. Сайчанка.* Мінск.

Асноўныя паказчыкі аховы здароўя ў БССР па ведамствах (у параўнанні з 1913)

	1913	1940	1950	1960	на 1.1.1969
Колькасць урачоў усіх спецыяльнасцей	1167	5214	7210	13 517	21 281
на 10 тыс. насельніцтва	1,7	5,7	9,3	16,4	23,9
Колькасць сярэдняга медыцынскага персаналу	2180	17 910	24 391	44 638	66 037
на 10 тыс. насельніцтва	3,2	19,7	31,3	54,3	74,2
Колькасць бальнічных устаноў	240	514	695	991	1050
Колькасць бальнічных ложкаў	6445	29 628	32 046	55 942	87 660
на 10 тыс. насельніцтва	9,3	32,6	41,2	68,0	98,5
Колькасць ложкаў для цяжарных і параданіц	274	5374	4268	6686	7106
Колькасць жаночых і дзіцячых кансультацый	—	311	433	459	533
Колькасць усіх дзіцячых дашкольных устаноў (яслі, яслі-сады, сады)	—	1316	732	1373	2261
Колькасць дзяцей у іх (тысяч)	—	64,0	29,0	98,5	246,7
Фельчарска-акушэрскія пункты	224	1565	1551	2366	2800
Санітарна-эпідэмічныя станцыі і аддзелы	—	143	218	164	169
Расходы на ахову здароўя і фізкультуру з дзяржбюджэту (у млн. руб.)	—	36,4	62,9	134,4	268,1
на душу насельніцтва (у руб.)	—	4,0	8,1	16,4	29,95
Колькасць фармацэўтаў з вышэйшай адукацыяй	—	291	286	613	1305
Колькасць санаторыяў	—	36	28	41	44
у іх ложкаў	—	4372	2768	5212	7236
Колькасць дамоў адпачынку	—	32	10	9	15
у іх ложкаў	—	5472	1925	1702	4007

пра маці і дзяцей паводле дэкрэта, падпісанага У. І. Леніным 31.12.1917,— абавязак дзяржавы, замацаваны ў арт. 122 Канстытуцыі СССР (арт. 97 Канстытуцыі БССР). У Асновах заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб ахове здароўя, прынятых 19.12.1969, вызначаны мерапрыемствы па ахове мацярынства і дзяцінства. А. м. і дз. ўключае: ахову працы жанчын, сацыяльную дапамогу маці і дзіцяці, выплату дапамогі па цяжарнасці і родах, мнагадзетным і адзінокім маці, абслугоўванне дзяцей дзярж. дзіцячымі ўстановамі і інш. У СССР і сацыяліст. краінах створана шырокая сетка дзіцячых устаноў. У дарэвалюц. Беларусі было 10 дзіцячых устаноў, за 50 гадоў Сав. улады тут пабудавана і дзейнічае 1658 дзіцячых садоў і ясляў, 99 дзіцячых дамоў, 127 школ-інтэрнатаў і 27 спецыяльных школ для дзяцей з фіз. недахопамі, працуе *Аховы мацярынства і дзяцінства навукова-даследчы інстытут*.

Да Кастр. рэвалюцыі ў гарадах і вёсках Беларусі не было ўстаноў ляч.-прафілакт. абслугоўвання жанчын і дзяцей. У 1969 такіх устаноў было 533, колькасць ложкаў для цяжарных жанчын і парадзіх павялічылася ў параўнанні з 1913 у 26 разоў. Усім жанчынам — работніцам, служачым і калгаснікам — даецца аплачаны водпуск на цяжарнасці і родах да 4 месяцаў. Гл. *Водпуск*.

Літ.: Подписаны Лениным. Документы, письма, воспоминания, [М.], 1968; Крупская Н. К. О бытовых вопросах, М.—Л., 1930; Чумакова Т. Е. Охрана прав матери и ребенка, Мн., 1967; Свердлов Г. М. Охрана интересов детей в советском семейном и гражданском праве, М., 1955; Белякова А. М., Карев Д. С. и Орлов В. С. Правовая охрана детства, М., 1968. *Т. Я. Чумакова.* Мінск.

АХОВА ПОМНІКАЎ гісторыі, мастацтва і культуры, сістэма мерапрыемстваў для захавання, засцярогі ад разбурэння і пашкоджання гістарычных, мастацкіх і культурных помнікаў.

У 1918 дэкрэтам Саўнаркома РСФСР, падпісаным У. І. Леніным, помнікі культуры ўзяты пад кантроль і ахову дзяржавы. 24.12.1923 СНК БССР прыняў пастанову пра абавязковую рэгістрацыю і ахову помнікаў мастацтва, старажытнасці, нар. побыту і прыроды, якія знаходзяцца ва ўласнасці ўстаноў, т-ваў і прыватных асоб. Ахову помнікаў да 1925 ажыццяўляў Наркамат асветы БССР, потым Інбелкульт. Першы спіс помнікаў культуры зацвярджаны пастановай СНК БССР 5.7.1925. Пасля Айч. вайны праведзена перарэгістрацыя помнікаў, што абвергліся, зацверджаны новыя спісы помнікаў баявой славы, гісторыі, архітэктуры і мастацтва, якія падлягалі дзярж. ахове. У снеж. 1966 створана *Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў*. З 1967 ахова помнікаў на тэр. Беларусі ўскладзена на Мін-ва культуры БССР, а нагляд за іх станам — на выканкомы мясцовых Саветаў дэп. працоўных і іх аддзелы культуры. 26.12.1969 Вярх. Савет БССР прыняў закон «Аб ахове помнікаў культуры».

Паводле ўрадавых пастаноў забараняецца знішчаць, пашкоджваць і выкарыстоўваць гістар. помнікі, музейныя экспанаты, знаходкі і скарбы; прадугледжваюцца мерапрыемствы па рэстаўрацыі, аднаўленні і інш. работы для іх захавання. Забараняюцца самавольныя работы на помніках без спец. дазволу *(адкрытага ліста)*: іх змена, перабудова, забудова, знос, а таксама ліквідацыя музейных

калекцый, помнікаў мастацтва і рэчаў у збудаваннях, якія ўзяты пад ахову. Вінаватыя ў наўмысным разбурэнні і пашкоджанні помнікаў прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці паводле арт. 225 Крымінальнага кодэкса БССР. На тэр. БССР узята пад ахову дзяржавы каля 6 тыс. *помнікаў гісторыі*, мастацтва і культуры (1970), з іх: 789 археалогіі (гл. *Археалагічныя помнікі*), 23 перыяду Айч. вайны 1812, 4717 *помнікаў рэвалюцыйнай і баявой славы*, 79 курганоў воінскай славы (гл. *Курганы славы*), 312 помнікаў У. І. Леніну (гл. *Ленініяна*), 78 помнікаў архітэктуры (гл. *Архітэктура*) і інш.

Кр.: О мерах улучшения охраны памятников культуры. Постановление Совета Министров СССР № 3898 [ад 14 кастр. 1948], М., 1948; Инструкция о порядке учета, регистрации и содержания археологических и исторических памятников на территории БССР. Утверждена постановлением Совета Министров БССР от 22 авг. 1949 г. № 990. «Собрание постановлений и распоряжений Совета Министров БССР», 1949 № 3; Пастанова ЦК КПБ і СМ Беларускай ССР «Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР» ад 19 вер. 1967 г. № 318, «Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў БССР», 1967, 5 кастр., № 28; Закон Беларускай Савецкай Рэспублікі аб ахове помнікаў культуры, там жа, 1969, 26 снеж., № 36.

П. Ф. Лысенка, І. Б. Элентух. Мінск.

АХОВА ПРАЦЫ, сістэма прававых, эканамічных, тэхнічных і санітарна-гігіенічных мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне здаровых і бяспечных умоў працы на вытворчасці. Прадугледжвае выкананне прававых палажэнняў і нормаў, якія накіраваны на аблягчэнне і аздараўленне ўмоў працы, ліквідацыю прычын вытворчага траўматызму і прафесіян. хвароб. КПСС, Сав. дзяржава і прафсаюзы дамагаюцца, каб усе органы, установы, прадпрыемствы, арг-цыі, службовыя асобы і грамадзяне плённа выконвалі заканадаўства пра А. п. У СССР А. п. забяспечваецца тэхнічным навучаннем работнікаў метадам бяспекі працы; дзярж. наглядам за правядзеннем мерапрыемстваў па А. п., якія ажыццяўляецца тэхн. інспекцыяй прафсаюзаў і спец. дзяржаўнымі інспекцыямі (горнатэхнічнай, катлонагляду, санітарнай і інш.); арганізацыяй грамадскага кантролю за станам А. п.; шырокай пастаноўкай тэхн. прапаганды сярод рабочых і служачых; устанаўленнем адміністрацыйнай, дысцыплінарнай, а ў больш сур'ёзных выпадках крымінальнай адказнасці службовых асоб за грубае парушэнне заканадаўства пра А. п. Тыповыя правілы ўнутранага працоўнага распарадку прадугледжваюць не толькі правы і абавязкі адміністрацыі прадпрыемстваў, устаноў і арг-цый у выкананні правілаў і нормаў А. п., тэхнікі бяспекі і вытворчай санітарыі, але і абавязкі саміх рабочых і служачых выконваць патрабаванні па бяспецы працы.

Паляпшэнне тэхнічных і санітарных умоў працы ажыццяўляецца ў СССР на аснове перспектыўных, пяцігадовых і бягучых планаў. Часам узнікае неабходнасць ажыццяўляць пазапланавыя прафілактычныя мерапрыемствы, што распрацоўваюцца ў сувязі з выкарыстаннем на прадпрыемстве новай тэхнікі або ў сувязі з няшчаснымі выпадкамі. Заканадаўства абавязвае адміністрацыю прадпрыемстваў улічваць і рэгістраваць няшчасныя выпадкі, што адбыліся на вытворчасці, а таксама выяўляць і ліквідаваць прычыны, якія іх выклікаюць. Каб папярэдзіць шкодны ўплыў на арганізм чалавека фактараў вытворчага асяроддзя, рабочым бясплатна выдаюць спецвопратку, спецабутак, засцерагальныя прыстасаванні, лячэбна-прафілактычныя харчы. Працоўнае заканадаўства прадугледжвае шэраг спец. нормаў па ахове працы, якія ўлічваюць фізіял. асаблівасці арганізма жанчын і падлеткаў. Яны не дапускаюцца да цяжкіх і шкодных для іх здароўя работ. Цяжарныя жанчыны і маці з грудзінымі дзецьмі не прыцягваюцца да начных і звышурочных работ, за імі захоўваецца месца работы, пасада, не перарываецца стаж і інш. Для падлеткаў 15—18 гадоў устаноўлены скарочаны працоўны дзень, ім даецца падоўжаны платны адпачынак (1 каляндарны месяц у летні час). Сав. дзяржава выдаляе на А. п. вялікія сумы (больш за 2 млрд. руб. у год). Парадак выкарыстання гэтых сродкаў і тэрміны ажыццяўлення мерапрыемстваў вызначаюцца ў асобных пагадненнях, якія заключаюцца паміж касп. органамі і ФЗМК прафсаюза і прыкладаюцца да калектыўных дагавораў. У калгасах арганізацыяй А. п. займаецца праўленне, якое зацвярджае гадавыя планы правядзення мерапрыемстваў па А. п., выдаткоўвае на гэта сродкі і назначае адказных асоб (грамадскіх інспектараў і санітарных упаўнаважаных) па калгасе, брыгадзе, ферме і інш. У 1966—67 на А. п. ў калгасах і саўгасах СССР эрасходавана 83 млн. руб. Дзякуючы эканам., тэхнічным і прававым мерапрыемствам, што праводзяцца ў СССР і ў інш. сацыялісг. краінах для А. п., рэзка знізіліся выпадкі вытворчага траўматызму і прафесіян. хвароб, тады як у капіталісг. краінах назіраецца рост вытворчага траўматызму і прафесіян. хвароб. Напр., у ЗША на вытв. штогод здараецца каля 2 млн. няшчасных выпадкаў, ад іх 14—15 тыс. рабочых гінне, а 75—80 тыс. атрымлівае цяжкія калецтвы.

Літ.: Киселев Я. Л. Охрана труда по советскому трудовому праву, М., 1962; Семенков В. Н. Надзор и контроль за охраной труда в СССР, Мн., 1963.

В. І. Семянкоў. Мінск.

АХОВА ПРЫРОДЫ, сістэма дзяржаўных і грамадскіх мерапрыемстваў, накіраваных на рацыянальнае выкарыстанне, аднаўленне, павелічэнне і зберажэнне прыродных рэсурсаў, паляпшэнне іх стану. Галоўная задача А. п.— зберагчы па як мага больш час прыродныя рэсурсы, якія не аднаўляюцца, аднавіць і палепшыць тое, што можна аднавіць.

Першыя заканадаўчыя акты па А. п. былі прыняты ў глыбокай старажытнасці (рэгламентаванне рыбалоўства вядома было ў Азіі з 246 да н. э.). У Расіі мерапрыемствы па А. п. вядомы з 11 ст. Прыватная ўласнасць на прыродныя багацці стварала неадольныя перашкоды для А. п. З сярэдзіны 19 ст. ў сувязі з вялікім попытам на драўнаменшалі лясныя масівы ў многіх губернях. З таго часу, як пачалі карыстацца агнястрэльнай зброяй і інш. ўдасканаленнямі паляванні і лову, знішчаны многія віды звяроў і птушак і яшчэ больш апынулася пад пагрозай вынішчэння.

Планамерная і шырокая дзейнасць па А. п. ў нашай краіне пачалася пасля Кастр. рэвалюцыі. Першы дэкрэт Сав. улады «Аб зямлі» (1917), складзены У. І. Леніным, абвясціў зямлю, яе нетры, воды і лясы ўсенародным багаццем. Гэтым была знята асн. супярэчнасць паміж грамадскім характарам А. п. і прыватнакапіталіст. спосабам выкарыстання прыродных багацця, стала магчыма планавае і комплекснае іх выкарыстанне і ажыццяўленне ахоўных мерапрыемстваў. Пазней быў выдадзены шэраг заканадаўчых актаў, якія забяспечвалі рацыянальнае выкарыстанне і зберажэнне прыродных багацц-



1




2



3



4




5



6

Афорт. 1. Рэмбрант. Тры дрэвы. 1643. 2. Ф. Гоя. Якая доблесць! З цыкла «Беды вайны». 1810—12. 3. А. А. Паслядовіч. Ганна. 1965. 4. А. М. Кашкурэвіч. Натхненне. 1966. 5. Г. Г. Паплаўскі. Ілюстрацыя да паэмы Я. Коласа «Новая зямля». 1967. 6. Л. С. Ран. Даваяваўся. 1962.



І. В. Ахрэмчык. Абаронцы Брэсцкай крэпасці. 1958. Дзяржаўны мастацкі музей БССР.

цяў: дэкрэты і пастановы «Аб лясах» (1918), «Аб цэнтральным камітэце водааховы» (1919), «Аб тэрмінах паляванння і праве на паляўнічую зброю» (1919), «Аб ахове зялёнай плошчы» (1920), «Аб ахове помнікаў прыроды, садоў і паркаў» (1921) і інш. У 1924 арганізавана Усерасійскае т-ва аховы прыроды, а пазней т-вы саюзных рэспублік. Створаны Дзярж. камітэт па ахове прыроды з міжведамаснымі камісіямі ў краях і рэспубліках (1925—33). У 1929 адбыўся Усерасійскі, а ў 1933 Усесаюзны з'езд па А. п. Пастаянае ўздзеянне чалавека на прыроду патрабуе ажыццяўлення мер па А. п. ў міжнар. маштабах. Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю «Эканамічнае развіццё і ахова прыроды» (№ 1831/XVII ад 18.12.1962). У 1948 па ініцыятыве ЮНЕСКО, Швейцарскай лігі па ахове прыроды і ўрада Францыі па ўстаноўчай канферэнцыі ў Фантэнбло (Францыя) створаны Міжнародны саюз па ахове прыроды (МСАП). Асноўная задача МСАП — садзейнічаць зберажэнню прыродных багацяў дзеля эканам., сацыяльных, навук. і культ. інтарэсаў, дзеля аховы здароўя людзей. СССР — член МСАП з 1956. З 1957 да 1964 ва ўсіх саюзных рэспубліках прыняты законы па А. п. У 1960 створаны Дзярж. камітэт Савета Міністраў БССР па А. п. з сеткай яго органаў на месцах. У 1961 на 6-й сесіі Вярх. Савета БССР прыняты закон па А. п. Беларускай ССР з шырокай праграмай практ. мерапрыемстваў. Закон прадугледжвае, што ахоўвацца дзяржавай і рэгулявацца павінны ўсе прыродныя багацці, незалежна ад ступені іх эксплуатацыі: зямля, воды паверхневыя, падземныя і глебавыя, нетры, лясы і інш. расліннyя покрывы зямлі, тыповыя ландшафты, рэдкія і славутыя прыродныя аб'екты, прыгарадныя зялёныя зоны, паркі, зялёныя насадкі ў населеных пунктах і пры дарогах, курортныя мясціны і жывёльны свет, а таксама атмасфернае паветра. Закон прадугледжвае неабходнасць выкладання асноў А. п. ў сярэдніх і вышэйшых навуч. установах, вызначае крымінальную адказнасць за парушэнні правілаў аховы і рацыянальнага выкарыстання прыродных багацяў. У Вярхоўным і мясцовых Саветах БССР створаны дэпутацкія камісіі па А. п. З 1955 у АН БССР функцыянірує навукова-кансультацыйны орган — Камісія па ахове прыроды. У крас. 1962 адбыўся ўстаноўчы з'езд па А. п., на ім створана *Беларускае таварыства аховы прыроды* (1485 тыс. чл., 1970). Гл. таксама *Помнікі прыроды*.

Літ.: Охрана природы — всенародное дело. [Зб. законаў], 2 изд., Мн., 1967; Благосклонов К. Н., Иноземцев А. А. и Тихомиров В. Н. Охрана природы, М., 1967; Охрана природы. Природные ресурсы Белоруссии и их рациональное использование, Мн., 1969.

В. М. Вялькоў, П. І. Жукаў. Мінск.

АХО́ВА РАСЛІН, комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на знішчэнне пустазелля, шкоднікаў і ліквідацыю хвароб раслін. Прадугледжвае стварэнне ўмоў для іх лепшага развіцця, росту і павышэння ўстойлівасці. У барацьбе са шкоднікамі раслін, пустазеллем, грыбнымі, бактэрыяльнымі і віруснымі хваробамі ўжываюцца спецыяльныя хім. рэчывы (пестыцыды), карысныя энтамафагі (пасякомыя, кляшчы) і мікраарганізмы. Супраць шкоднікаў выкарыстоўваюцца высокія і нізкія т-ры, ультракароткія хвалі ультрагукавых ваганняў, розныя прыстасаванні, што абмяжоўваюць рассяленне шкодных арганізмаў (канавы, ліпучыя кольцы і інш.). Дзярж. інспекцыя па каранціне раслін БССР праводзіць мерапрыемствы, каб папярэдзіць пранікненне ў рэспубліку новых каранцінных хвароб, шкоднікаў і пустазелля. У БССР створана 47 спец. атрадаў па А. р. (1968), якія маюць неабходную тэхніку, апаратуру і ядахімікаты. Атрады выконваюць каля 80% хім. апрацовак раслін. Шырока выкарыстоўваецца авіяхім. метад, асабліва ў барацьбе з калорадскім жуком і фітафторай бульбы. Пры мін-вах с. гасп. і лясной гасп. створаны службы (з сеткай назіральных пунктаў) уліку і прагнозаў паяўлення і пашырэння шкоднікаў і хвароб. Мерапрыемствы для А. р. распрацоўваюць Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы, Бел. НДІ земляробства, Мінская доследная станцыя па калорадскім жуку, нематодах і раку бульбы Усесаюзнага ін-та аховы раслін, абласныя дзяржаўныя с.-г. доследныя станцыі. У Гродзенскім с.-г. ін-це ёсць ф-т аховы раслін.

Літ.: Брянцев Б. А. Сельскохозяйственная энтомология, Л., 1966; Берим Н. Г. Химическая защита растений, Л., 1966; Амбросов А. Л. Вирусные болезни картофеля и методы выращивания здоровых клубней, Мн., 1964.

А. Л. Амбросаў. Мінск.

АХО́ВЫ МАЦЯРЫ́НСТВА І ДЗЯЦІ́НСТВА НАВУКО́ВА-ДАСЛЕ́ДЧЫ ІНСТЫТУ́Т Міністэрства аховы здароўя БССР, заснаваны ў 1931 у Мінску. Дырэктар канд. мед. навук Г. А. Калюжын (з 1959). Аддзелы: педыятрыі, мацярынства, арганізацыйна-метадычны; 3 лабараторыі, кабінеты. Ін-т вывучае праблемы аховы здароўя жанчыны, маці і нованароджанага; *асфіксію* нованароджанага, яе прафілактыку і вынікі; выпрацоўвае стандарты фізічнага развіцця дзяцей; вядзе арганізацыйна-метадычную і кансультацыйную работу; рыхтуе санітарна-асветную літаратуру. Пры ін-це клінічная ардынатура па педыятрыі і акушэрскай гінекалогіі. Вынікі даследаванняў публікуюцца ў зборніках матэрыялаў навук. сесій, у зб. «У дапамогу маладой маці» (з 1960 выйшлі 3 выд.).


АХО́НАВА, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ахонава». За 15 *км* на ПнУ ад Дзятлава, 4 *км* ад чыг. ст. Яцукі. 520 ж., двароў 177 (1970). Сярэд. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, павільён быт. абслугоўвання. Першыя звесткі пра А. адносяцца да 17 ст., калі вёска належала канцлеру Вял. кн. Літ. Сапегу. У 1905 у А. дзейнічалі сацыял-дэмакраты, якія ўваходзілі ў Дзятлаўскую групу РСДРП. Помнік сав. воінам і партызанам — жыхарам Ахонаўскага с/с, якія загінулі ў Айч. вайну.

360853
Центральная научная
БИБЛИОТЕКА

АХО́П, манеўр войск у баі (аперацыі), які дае магчымасць нанесці ўдар па адным ці абодвух флангах групоўкі праціўніка. Ажыццяўляецца ў тактычным і агнявым узаемадзеянні з войскамі, што наступаюць з фронту, найчасцей пасля прарыву абароны праціўніка, калі ў яго баявым парадку ўтвараюцца адкрытыя флангі.

АХО́ЎНЫ ГРУНТ, участак зямлі пад спецыяльнымі збудаваннямі для вырошчвання раслін і расады ва ўмовах штучнага клімату. Гл. *Цяплічна-парніковая гаспадарка.*

АХО́ЎНЫ ЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ АЎТАМА́Т, аўтаматычны выключальнік, які забяспечвае бесперабойную работу электрычных рухавікоў, генератараў, прылад і інш. спажыўцоў эл. энергіі. Бываюць нізкавольтавыя (да 500 *в*) і высакавольтавыя. Падзяляюцца на аўтаматы макс. і мінім. току, абмежавання напружання і аўтаматы адваротнай магутнасці.



Прынцыповая схема ахоўных электрычных аўтаматаў:
а — максімальнага току; *б* — мінімальнага току; *в* — мінімальнага напружання; *г* — адваротнай магутнасці.

Аўтаматы макс. і мінім. току адключаюць спажыўцоў эл. энергіі пры павышэнні ці паніжэнні сілы току. Яны складаюцца з эл. выключальніка і магнітаэл. рэле. Прынцып дзеяння аўтамата макс. току (*а*) такі: калі ток у эл. ланцугу павялічваецца, шпуля *Ш* уцягвае жалезны стрыжань і зашчапка *З* вызваляе спружыну *С*; апошняя разрывае кантакты *К* і адключэннем спажыўца эл. энергіі. У аўтамаце мінім. току (*б*) шпуля *Ш* стрымлівае жалезны стрыжань і зашчапку, пакуль ток у ёй не зменшыцца да мінім. значэння. Аўтамат абмежавання напружання (*в*) прызначаецца, каб адключыць эл. прылады пры змене напружання; прынцыпам дзеяння ён падобны да аўтамата мінім. току, толькі ўключаецца паралельна ў эл. ланцуг. Аўтамат адваротнай магутнасці (*г*) прызначаецца для адключэння адпаведнага ці некалькіх паралельных генератараў пры змене кірунку перадачы эл. энергіі. Шпуля току $Ш_1$ утварае магн. поле, процілеглае полю шпулі напружання $Ш_2$, таму шпулі не могуць уцягнуць жалезны стрыжань і вызваліць зашчапку *З*. Пры змене кірунку перадачы эл. энергіі ток шпулі $Ш_1$ змяняецца на адваротны, магн. палі шпуляў складваюцца, і жалезны стрыжань уцягваецца, размыкаючы эл. ланцуг. Высакавольтавыя (да 3000 *в*) А. э. а. хуткадзейныя. Прызначаны забяспечыць безаварыйную работу ртутных выпрамнікоў, эл. машын і эл. прылад пры кароткім замыканні, перагрузцы і адваротным току.

Літ.: Попов В. С., Мансуров Н. Н. и Николаев С. А. Электротехника, 7 изд., М.—Л., 1964.


Г. Ф. Салтлоў. Мінск.

АХО́ЎНЫЯ АДДЗЯЛЕ́ННІ (ахранка), органы тайнай паліцыі ў царскай Расіі, якія займаліся палітычным вышукам. Створаны ў 1866 у Пецярбурзе, у 1880 — Маскве і Варшаве. У 1914 існавала 26 А. а., у т. л. Беластоцкае і Віленскае. А. а. падпарадкоўваліся Дэпартаменту паліцыі, мелі сакрэтную агентуру нагляду, выкарыстоўвалі правакацыйныя метады ў барацьбе з рэвалюц. рухам. У вялікіх гарадах ствараліся «аддзяленні сакрэтнай цэнзуры» для праверкі карэспандэнцыі. Матэрыяламі А. а. карысталіся губернскія жандарскія ўпраўленні пры арыштах і допытах рэвалюцыянераў. А. а. ліквідаваны ў час Лютаўскай рэвалюцыі 1917.

АХО́ЎНЫЯ ЛЯСЫ, прыродныя ці штучна ўтвораныя палосы або масівы лесу для абярожання розных аб'ектаў ад неспрыяльных уздзеянняў асяроддзя.

Полеахоўныя лясныя палосы ахоўваюць палі, сады, вінаграднікі ад сухавеяў, чорных бур, спрыяюць раўнамернаму размеркаванню снегу і паляпшэнню воднага рэжыму; глебаахоўныя палосы ўпоперак схілаў ахоўваюць глебу ад змыву і размыву; прыяравыя ахоўваюць крутыя адхоны, берагі і дно яроў ад размывання; ёсць палосы і насадкі, якія замацоўваюць рухомыя пяскі і засцерагаюць ад іх палі і збудаванні, ахоўваюць берагі рэк, каналаў, вадасховішчаў, азёраў ад развурэння; насадкі ўздоўж чыгунак і шашэйных дарог ахоўваюць дарогі ад снежных і пясчаных заносаў, а на электрыфікаваных участках — кантактную электрасетку ад абледзянення; супрацьпажарныя насадкі (з лісцевых парод дрэў) высаджваюцца ў сельскай мясцовасці між будынкаў, навокал бензасховішчаў, складаў, а таксама сярод вялікіх масіваў хвойных лясоў; ахоўныя насадкі пры фермах і вялёныя парасоны ствараюцца ў сухім стэпе і паўпустыні, каб засцерагчы жывёлагадоўчыя фермы ад заносу снегам, пяском і пылам, а жывёлу — ад халодных зімовых вятроў і летняй спёкі. Да А. л. належаць лясы вялёных зон вакол гарадоў, а таксама насадкі ўздоўж вялікіх рэк і вадасховішчаў, ад чаго павялічваецца агульная воднасць рэк, падтрымліваецца раўнамернае жыўленне рэк і азёраў грунтавымі водамі ў летні перыяд, рэкі і азёры менш заільваюцца цвёрдымі часткамі паверхневага сцёку.

На Беларусі ёсць А. л. па Зах. Дзвіне, Дняпры, Сажы, Бярэзіне, Нёмане, Прыпяці, Мухавцы, Піне, Віліі, Свіслачы, Друці, Дняпроўска-Бугскім канале і каля азёраў Нарач, Мядзел, Мястра, Баторын (Мінская вобл.), Снуды, Волас, Струста, Дрывяты, Богінскае, Шылаўскае, Стрэчна (Віцебская вобл.), Крушынаўскае (Гомельская вобл.), Свіцязь (Гродзенская вобл.), Белае, Выганаўскае (Брэсцкая вобл.). Да гэтых лясоў, плошча якіх каля 300 тыс. *га*, аднесены гал. ч. 3—4-кіламетровыя палосы ўздоўж берагоў рэк. Палосы лясоў у 500 *м* па берагах рэк належаць да асабліва ахоўных. У зялёных зонах (радыус ад 3 да 30 *км*), што вылучаны на Беларусі навокал усіх вялікіх гарадоў і многіх раённых цэнтраў, 400 тыс. *га* лесу; больш як 430 тыс. *га* лесу належыць да ахоўных насадак уздоўж шашэйных дарог і чыгунак.



Ахоўныя лясы Асіповіцкага вадасховішча на р. Свіслач.

Літ.: Лесные защитные насаждения, М., 1963; Рахманов В. В. Водоохранная роль лесов, М., 1962; Шестое всесоюзное совещание по охране природы. Минск, 12—17 авг. 1963, Мн., 1965.

М. Ф. Лойчы. Мінск.

АХО́ЎНЫЯ ПАКРЫ́ЦЦІ, паверхневыя слаі, якія ахоўваюць вырабы ад карозіі, павышаюць трываласць, надаюць дэкаратыўны выгляд. А. п. класіфікуюцца паводле спосабу іх нанясення, матэрыялу, таўшчыні, бляску і дадатковай апрацоўкі. Металічныя А. п. бываюць анодныя і катодныя. Цынкавыя і кадміевыя пакрыцці на стальных вырабах заўсёды анодныя. Яны ахоўваюць вырабы механічна (сваім слоем) і электрахімічна (пры акісленні метал-анод разбураецца, засцерагаючы ад карозіі метал-катод). Катодныя пакрыцці (хром, нікель на сталі) маюць высокую хімічную стойкасць, цвёрдасць і прыгожы выгляд.

А. п. наносяцца на вырабы, ачышчаныя ад іржы, акаліны, тлушчу. Пераважна ўжываецца гальванічны спосаб: хромавыя, нікелевыя, жалезныя і інш. А. п. Іх атрымліваюць у электраліце пад дзеяннем эл. току (*гл. Гальванатэхніка*). Каб вменшыць порыстасць гальванічных пакрыццяў, іх робяць многаслойнымі, павялічваюць таўшчыню ці шчыльнасць. Ахоўны метал (цынк, алюміній, кадмій) на вялікія збудаванні, канструкцыі і дэталі машын наносяць *металізацыяй*. Ужываюць таксама плазмавае напыленне тугаплаўкіх матэрыялаў на металы, кераміку, пластмасы; шкло, дрэва, пры якім расплаўленне і распыленне матэрыялаў ажыццяўляецца высокатэмпературным плазмавым струменём. Тонкія слаі алюмінію, нержавеючай сталі, медзі накладаюць на інш. металы гарачай пракаткай — плакіроўкай. Пакрыцці з волава на латуні і сталі, з волата на серабры, з медзі, нікелю і серабра на сталі атрымліваюць кантактавым спосабам: вылучаюць металы з растворaў іх соляў, не карыстаючыся эл. токам. Рознымі хім. спосабамі наносяць нікелевыя, хромавыя, кобальтавыя і інш. пакрыцці. У залежнасці ад умоў эксплуатацыі і асяроддзя практыкуюць таксама *алітаванне, залачэнне, цэментацыю*, гарачы спосаб (вырабы акунаюць у расплаўлены метал). Неметалічныя А. п. робяцца лакамі і фарбамі, пластмасамі, гумаю, шклоэмалямі, керамікай, а таксама солепадобнымі і аксіднымі плёнкамі, якія ўтвараюцца пры хім. і эл.-хім. апрацоўцы вырабаў у спец. растворах. Пашыраны *лакафарбавыя пакрыцці*, бо іх лёгка наносіць і ўзнаўляць пэндзлем ці пульверызатарам. Пластмасавыя пакрыцці (поліэтылен, фторапласты, вінілпласт, матэрыялы на аснове бакелітавых і эпаксідных смол) засцерагаюць вырабы, пераважна хім. апаратуру, ад дзеяння вады і кіслот. Плёнкі пластмасы часцей наносяць на паверхні вырабаў віхравым ці газаполымным напыленнем або аблiцоўкай ліставымі матэрыяламі. Пакрыццё гумай і хлоркаўчуком эфектыўна засцерагае вырабы ад дзеяння кіслот і інш. хім. рэагентаў. Керамічныя пакрыцці, нанесеныя плазмавым напыленнем ці эмаліраваннем, ахоўваюць вырабы ад высокіх т-р і агрэсіўных асяроддзяў (гл. таксама *Футэроўка*). Вазелін, парафін, масла наносяць на метал часова, пакуль вырабы не эксплуатуюцца.

Літ.: Самойлов А. И. Защита металлов от коррозии (Обзор зарубежной техники), М., 1960; Усов Л. Н. и Борисенко А. И. Применение плазмы для получения высокотемпературных покрытий, М.—Л., 1965; Новые материалы в технике, М., 1964.

АХО́ЎНЫЯ ПРЫСТАСАВА́ННІ ў жывёл, асаблівасці будовы і афарбоўкі цела, якія забяспечваюць ахову ад ворагаў, шкодных фактараў асяроддзя і гэтым спрыяюць захаванню віду. Утварыліся эвалюцыйна ў барацьбе за існаванне. Бываюць у прадстаўнікоў розных класаў жывёльнага свету: млекакормячых, паўзуноў, насякомых і інш.

Падзяляюцца на сродкі актыўнай і пасіўнай аховы. Актыўныя сродкі: здольнасць хутка бегаць (заяц, джэйран і інш.) і лятаць (лятучыя мышы, птушкі, насякомыя); будаванне «хатак» з падводным выхадам (бабёр, нутрыя); стадны інстынкт, супольная ахова маладняку ў капытных, малпаў; жыгучыя клеткі ў беспазваночных; ядавітыя залозы і джалы ў пчол, восаў, скарпіёнаў, змей і інш.; электрычныя органы ў скатаў; іголкі ў вожыкаў і дзікабразаў; панцыры ў браняносцаў, чарапах, яшчараў; ядавітыя і агіднага паху залозы ў насякомых, скунса і тхара; рогі ў зубра, казла, барана, насарога і інш. Сродкі пасіўнай аховы — здольнасць мець афарбоўку таго колеру, які пераважае ў навакольным асяроддзі (ахоўная, крыптычная афарбоўка). Напр., зялёныя конікі мала адрозніваюцца ад травы; самкі птушак, што гняздуюцца на зямлі, маюць стракатае апярэнне, якое нагадвае лясны подсціл.



Бярозавы пядзенік і яго вусень.

Некаторыя жывёлы здольныя мяняць колер у залежнасці ад перамены фону (у хамелеона, камбалы, крэветак, кальмараў, каракаціцы і інш.). Абаронай ад ворага служыць мімікрыя — падабенства да якога-н. прадмета, расліны ці інш. жывёл (вусені матылькоў-пядзенікаў падобныя на сучкі і галінкі). Прыватны выпадак мімікрыі — міметызм, калі жывёла афарбоўкай і формай нагадвае інш. жывёлу, здольную сябе абараняць. Такое прыстасаванне бывае ў насякомых (некаторыя бяскшкодныя матылі і мухі ў палёце не адрозніваюцца ад куслівых насякомых) і ў пазваночных, напр. зязюля нагадвае каршуна.

А. п. маюць вялікае значэнне, але поўнай аховы ад ворага не гарантуюць і часам могуць загубіць жывёлу: заяц, рана пералінялы ўвосень, робіцца лёгкай здабычай драпежнікаў, калі доўга не выпадае снег.

Літ.: Котт Х. Приспособительная окраска животных, пер. с англ., М., 1950.

У. С. Раманаў. Мінск.


АХОЦІН Радзівон Арцёмавіч [н. 11(24).4. 1907, в. Мары-Лугавая Чэбаксарскага пав. Казанскай губ.], адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. У Чырв. Арміі

ь 1938. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У жн. 1941 у в. Межава Расонскага р-на Віцебскай вобл. арганізаваў падпольную групу, у крас. 1942 — партыз. атрад, які быў пераўтвораны ў *партызанскую брыгаду імя І. В. Сталіна*. Узнаг. ордэнамі Леніна, Айч. Вайны 1-й ступені, медалямі. Жыве на радзіме.

АХО́ЦКАЕ МО́РА, мора Ціхага акіяна каля берагоў Азіі. Аддзяляецца ад акіяна п-вам Камчатка і Курыльскімі а-вамі. Праліваміі Невяльскога, Татарскім і Лаперуза злучаецца з Японскім м. Пл. 1590 тыс. *км*². Сярэдняя глыб. 859 *м*. Берагавая лінія парэзана слаба. Залівы: на Пн — Шэліхава, у паўд.-зах. частцы — Аніва, Цярпення, Сахалінскі. Шантарскія і інш. а-вы (акрамя в-ва Іоны) знаходзяцца недалёка ад берагоў. Паўн. і паўн.-зах. часткі А. м.— мацерыковая водмель глыб. да 106—107 *м*, сярэдняя частка — мацерыковы схіл глыб. ад 283—340 да 2000 *м*, паўд. і паўд.-ўсх. часткі — глыбокая катлавіна да 3471 *м*. У А. м. ўпадаюць: Амур, Уда, Ахота, Кухтуй, Яма, Гіжыга, Пенжына, Тыгіль, Вялікая, Азёрная і на в-ве Сахалін Тым. Праз глыбаководныя Курыльскія пралівы ідзе водаабмен А. м. і Ціхага ак. Летам т-ра вады на паверхні 8—12 °С. З кастр. да чэрвеня мора ўкрыта лёдам. Сярэдняя салёнасць 31—32‰. У А. м. самыя вялікія прылівы ў СССР. У Пенжынскай губе яны больш за 13 *м*, каля Шантарскіх а-воў 8 *м*. Мясцовыя цячэнні супраць гадзіннікавай стрэлкі. Жывёльны свет вельмі разнастайны. Прамысл. рыбы: ласасёвыя (кета, гарбуша, чырвоная, чавыча, кіжуч, сіма), ціхаак. селядзец, камбала, трасцюлені, радзей кіты, марскі коцік і выдра. Гал. порты Магадан, Карсакаў, Ахоцк.

Літ.: Добровольский А. Д. и Залогин Б. С. Моря СССР. М., 1965; Шлямин Б. А. Охотское море, М., 1957.

АХРЭ́МЧЫК Іван Восіпавіч [н. 3(16).12.1903, Мінск], беларускі савецкі жывапісец, педагог. Народны мастак БССР (1949). Чл. КПСС з 1965. Праф. (1964). Вучыўся ў Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрнях (Вышэйшым маст.-тэхн. ін-це, 1922—30) у К. Істоміна, А. Шаўкарціны, пейзажа, манумент. роспісу. Удзельнічае ў выстаўках з 1921. У творчасці А. ўпершыню ў жывапісе Беларусі адлюстраваны тэмы сацыяліст. буд-ва, стапаўлення Сав. улады, гісторыі Сав. Беларусі («Падпісанне маніфеста аб стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі», 1929). Адзін са стваральнікаў *Рэвалюцыйнай арганізацыі мастакоў Беларусі*. Гал. мастак Усебеларускай выстаўкі с. гасп. і прамысловасці, для якой выканаў 2 пано на тэму






І. В. Ахрэмчык. Партрэт дзяўчыны. 1947. Дзярж. маст. музей БССР.

«Белапольскія акупанты» (1930). Напісаў для бел. павільёна Усесаюзнай с.-г. выстаўкі (1939) дэкаратыўны фрыз «Свята беларускага народа». Стварыў карціны «Другі з'езд РСДРП» (1935—37), «Уступление Чырвонай Арміі ў Мінск» (1935); партрэты Дз. Жураўлёва (1928), Ю. Пэна (1938), У. Галубка, А. Александровіча, І. Харыка, П. Галавача і інш. (амаль ні адна работа даваеннага часу не збераглася). У Айч. вайну супрацоўнічаў у сатырычнай газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1943—44), стварыў тэматычныя карціны («Твар ворага», 1942; «Пасяджэнне ЦК КП(б) Беларусі 3 ліпеня 1941 г.», 1944), партрэты П. Глебкі, З. Васільевай, Г. Глебава, Г. Семяніхіна (усе 1943). Пасля вайны піша партрэты: Е. Міровіча (1952), М. Осіпавай і маладога рабочага (абодва 1959), вялікую ўвагу аддае пейзажу. У 1950—51 гал. мастак павільёна БССР на Усесаюзнай с.-г. выстаўцы. У 1955 з І. Давідовічам распісаў плафоны фае Бел. т-ра юнага гледача ў Мінску і пано канферэнц-залы Бел. таварыства дружбы з зарубежнымі краінамі. Асобнае месца ў творчасці А. займае карціна «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» (1958), якая раскрывае гераізм і непахіснасць савецкіх людзей. Творчасці А. ўласцівыя майстэрства, заснаванае на рэаліст. традыцыях, псіхалагізм, увага і пашана да сучасніка, яснасць формаў, гарманічнае спалучэнне тонаў. А. творчую працу спалучае з педагагічнай: у Віцебскім маст. тэхнікуме (1931—41), Мінскім маст. вучылішчы (1949—53), Бел. політэхн. ін-це (1953—63), Бел. тэатр.-маст. ін-це (з 1963 заг. кафедры жывапісу). Дэп. Вярх. Савета БССР 2—4-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Гл. таксама ўклейку.

Літ.: Аладова Е. В. Иван Осипович Ахремчик, М., 1960; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960. *Л. Н. Дробаў. Мінск.*

АХУ́НДАЎ Мірза Фаталі [1812, г. Нуха — 26.2(10.3).1878], азербайджанскі пісьменнік, філосаф-матэрыяліст, асветнік-дэмакрат і грамадскі дзеяч. З сям'і купца. У 1834 паступіў на службу ў канцылярыю гал. кіраўніка грамадзянскай часткі Каўказа як перакладчык з усходніх моў. На гэтай пасадзе працаваў да канца жыцця. Знаёмства і дружба з перадавымі прадстаўнікамі Расіі і Закаўказзя, вывучэнне ўсх. класікі, прагрэсіўнай рус. і зах.-еўрап. л-р зрабілі ўплыў на фарміраванне поглядаў А. Літ. дзейнасць пачаў як паэт. Першы вядомы твор А.— паэма «На смерць Пушкіна» (1837). У 50-я г. стварыў камедыі «Мала Ібрагім Халіл, алхімік, уладальнік філасофскага каменя» (нап. 1850), «Мусье Жардан, батанік, і дэрвіш Масталі — шах, славуты чараўнік» (нап. 1850), «Везір Ленкараискага ханства» (1851), «Мядзведзь, пераможца разбойніка» (1851), «Прыгода скнары» (1852), «Правазаступнікі ў горадзе Таўрызе» (1855), у якіх праўдзіва паказаў быт, норавы і звычкі памешчыкаў і купцоў, духавенства, ханаў і везіраў, простых сялян. Сваімі камедыямі А. прыпёс у азерб. л-ру новы змест і новую маст. форму, спрыяў развіццю літ. мовы, заклаў асновы нац. рэаліст. драматургіі. Сатыр. аповесць «Падманутыя зоркі» (1857) стала пачаткам рэаліст. прозы ў Азербайджане. У літ.-крыт. артыкулах выступаў супраць фармалістычна-эпігонскай і рэліг.-міст. паэзіі, змагаўся за рэаліст. мастацтва. У філас. трактаце «Тры пісьмы...», у артыкулах 60—70-х г. выступаў супраць дэспатызму і самадурства ўсх. правіцеляў, супраць рэліг.-ідэаліст. светапогляду. Аддзяляў філасофію і навуку ад рэлігіі і тэалогіі і заклікаў вывучаць з'явы прыроды. Матэрыю разглядаў як аснову і сутнасць усяго існага. Прыхільнік народаўладдзя. У працы «Крытыка «Ек кельме» (1875) і пісьмах выказваў думку пра аварыжанне прыгнятальнікаў. У 1873 на аснове лацінскага і рускага склаў новы алфавіт, прыстасаваны да гукавой сістэмы азерб. мовы. Творчасць А. мела вялікі ўплыў на развіццё рэаліст. л-ры і перадавой грамадскай думкі ў Азербайджане і ў многіх краінах Б. Усходу.



Тв.: Рус. пер.— Обманутые звезды. Избранное, М., 1963.

Літ.: Джафаров Д., М. Ф. Ахундов. Критико-биогр. очерк, М., 1962; Рафили М. Г., М. Ф. Ахундов, Баку, 1957. *Н. Мамедаў.* Баку.

АЦЁК, агульныя ці мясцовыя праявы парушэння воднага абмену арганізма, калі вада, бялкі і электраліты намнажаюцца па-за клеткамі ці ў серозных поласцях цела. Аснова А.— парушэнне пры паталагічных працэсах водна-салявога абмену, які рэгулюецца нервовай сістэмай, антыдыўрэтычным гармонам гіпофіза і альдастэронам.

А. бывае пры затрымцы натрыю ў арганізме (сардэчная недастатковасць, цыроз печані, нефрыты, ціжарнасць), парушэнні анкатычнага ціску (нефрозы), застоі крыві (тромбафлебіты, павышэнне ціску ў сасудах лёгкіх), запаленні, інтаксікацыі, алергіі і г. д.

Прыкметы А.: павелічэнне аб'ёму, змена формы органа ці часткі цела, памяншэнне эластычнасці, паніжэнне т-ры і павышэнне бляску паверхні серозных абалонак, скуры і г. д. Лячэнне: ліквідацыя асн. хваробы, дыэта з абмежаваннем вадкасці і солі (ці без солі), мачагонныя сродкі. *А. М. Гурленя.* Мінск.

АЦМІНАВА, вёска ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Праўда». За 27 *км* на Пн ад Навагрудка, 200 *км* ад Гродна, 50 *км* ад чыг. ст. Наваельня. 1912 ж., дварой 571 (1970). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У Вял. Айч. вайну паблізу А. дзейнічалі партыз. атрады Баранавіцкага злучэння. У 1943 вёску спалілі фашысты. Помнік 75 жыхарам — ахвярам фашызму.

АЦЫДАФІ́ЛЬНЫЯ БАКТЭ́РЫІ, воцатнакіслыя і некаторыя малочнакіслыя бактэрыі, якія могуць развівацца ў кіслым асяроддзі. Сустракаюцца ў кішэчніку названочных, у глебе, на раслінах, у малочных прадуктах, на часцінках жывёльнага і раслінага паходжання, якія гніюць. Сярод А. б. вялікае значэнне маюць ацыдафільныя палачкі, якія выклікаюць малочнакіслае браджэнне малочных і інш. цукраў. Ідуць на прыгатаванне ацыдафільнага малака і ацыдафіліну.

Ацыдафільныя палачкі выклікаюць малочнакіслае браджэнне ў тоўстым кішэчніку і стрымліваюць развіццё гніласных і некаторых хваробных мікраарганізмаў. Падобны да ацыдафіліну лактабацылін, прапанаваны І. І. Мечнікавым,— выпік заквашвання малака змяшанай культурай балгарскай палачкі і Streptococcus lactis. Ацыдафілін і лактабацылін — харчовы дыэтычны прадукт і лячэбны сродак ад страўнікава-кішачных хвароб.

АЦЫКЛІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ (*аліфатычныя злучэнні, злучэнні тлустага раду*), арганічныя рэчывы, у якіх атамы вугляроду ўтвараюць адкрытыя ланцугі. Адрозніваюць насычаныя А. з., якія маюць толькі простыя сувязі паміж атамамі вугляроду і з'яўляюцца вытворнымі вуглевадародаў раду *метану* CH_4, і ненасычаныя, якія маюць адну ці некалькі двайных і трайных вугляроднымі сувязей і з'яўляюцца вытворнымі раду *этылену* $H_2C{=}CH_2$ і *ацэтылену* $HC{\equiv}CH$. Пад дзеяннем высокіх т-р насычаныя вуглевадароды ператвараюцца ў ненасычаныя, якія ў прысутнасці каталізатараў лёгка далучаюць вадарод і зноў пераходзяць у насычаныя вуглевадароды. А. з. могуць пераходзіць у цыклічныя, напр. ацэтылен у араматычны вуглевадарод *бензол*.

А. з.— вельмі шматлікі і рознабаковы клас арган. рэчываў. Да іх належаць вуглевадароды і іх вытворныя: спірты, кіслоты, эфіры, аміны, нітрапрадукты, амінакіслоты, тлушчы і вугляводы (цукры, крухмал, клятчатка) і інш. Гал. крыніцай А. з. з'яўляецца нафта, прыродны газ, прадукты раслінага паходжання (тлушчы, цукры, клятчатка) і прадукты, атрыманыя сінтэтычна з вадароду

і вокісу вугляроду. Напр., з нафты крэкінгам атрымліваюць маторнае паліва і змазачныя рэчывы, з вадароду і вокісу вугляроду — сінтэтычны метанол і бензін; этылен гідратацыяй ператвараюць у сінтэтычны этылавы спірт, а пры акісленні яго паветрам — у ацэтальдэгід і г. д. Многія пенасычаныя А. з. з'яўляюцца сыравінай у вытворчасці сінт. валокнаў, пластычных мас, сінт. каўчуку. З ацэтылену атрымліваюць воцатную к-ту, хларапрэн і інш. Вытворчасць арган. растваральнікаў (ацэтону, эфіру, хлараформу і інш.), мыла, пахучых рэчываў заснавана на перапрацоўцы А. з. *К. Л. Майсяйчук.* Мінск.

АЦЭТАВОЦАТНЫ ЭФІР, $CH_3COCH_2COOC_2H_5$, бясколерная вадкасць з прыемным пахам, слаба растваральная ў вадзе, *t* пл.— 45 °С, *t* кіп. 181 °С. Выкарыстоўваецца ў фармацэўтычнай прамысл., у вытв. фарбавальнікаў для каляровай фатаграфіі і ў арган. сінтэзе.

Упершыню атрыманы ў 1863 дзеяннем металічнага натрыю на этылацэтат. А. э. ёсць рэчнаважная сумесь дзвюх таўтамерных формаў (кетоннай і енольнай), здольных пераходзіць адна ў адну (гл. *Таўтамерыя*), таму ён адначасова мае хім. ўласцівасці кетону і енолу. Прысутнасць кожнай з формаў у А. э. залежыць ад тэмпературы, матэрыялу сасуда, у якім ён захоўваецца, і растваральніка.

АЦЭТОН, CH_3COCH_3, арганічнае рэчыва з класа кетонаў. Бясколерная вадкасць з своеасаблівым пахам, *t* пл.— 95,4 °С, *t* кіп. 56,2 °С, шчыльн. 818,6 *кг/м*³, змешваецца з вадой, спіртам і эфірам у любых адносінах, з водных растворaў высольваецца хлорыстым кальцыем і паташом. Выкарыстоўваецца як растваральнік многіх арган. рэчываў, у вытв. ацэтылцэлюлозы, нітрацэлюлозы, лакаў і плёнак. З яго атрымліваюць каштоўныя хім. прадукты: сінтэтычны каўчук, фармацэўтычныя прэпараты.

А.— рэакцыяздольнае рэчыва: пры нізкіх т-рах утварае прадукты далучэння галагенавадародных к-т, узаемадзейнічае з амінкам, утвараючы дыі трыацэтонаміны, з бісульфітамі натрыю і калію дае крышталічныя рэчывы, уступае ў рэакцыі кандэнсацыі, з гідраксіламінам і фенілгідразінам дае злучэнні, па якіх яго можна вызначыць. У прамысл. А. атрымліваюць акісленнем або дэгідраваннем ізапрапілавага спірту, атрыманага з прапілену; гідратацыяй ацэтылену вадзяной парай у прысутнасці каталізатараў і інш. метадамі. Біяхімічна яго атрымліваюць з крухмалу ацэтонтэрый. А. трапляецца ў крыві і мачы хворых на дыябет. *І. Ф. Асіпенка.* Мінск.

АЦЭТОНАВЫЯ ЦЕЛЫ (кетонавыя целы), група арганічных злучэнняў, якія ўключаюць β-оксімасляную $CH_3CHOHCH_2COOH$, ацэтавоцатную CH_3COCH_2COOH кіслоты і *ацэтон* CH_3COCH_3.

β-Оксімасляная і ацэтавоцатная к-ты — прамежкавыя прадукты нармальнага абмену рэчываў; пры канчатковым акісленні іх у здаровым арганізме ўтвараецца вада і вуглякіслы газ. Калі паніжана адольнасць арганізма акісляць рэчывы к-ты назапашваюцца ў крыві і мачы хворых у таксічных дозах і часткова ператвараюцца ў ацэтон, які выдзяляецца нават праз лёгкія. Ад увядзення ў арганізм інсуліну ці дадатковай колькасці вуглеводаў утварэнне А. п. памяншаецца. *М. Ф. Меражынскі.* Мінск.

АЦЭТЫЛЕН, C_2H_2, першы член гамалагічнага раду ацэтыленавых вуглевадародаў агульнай формулы C_nH_{2n-2}. Належыць да *ацыклічных злучэнняў*.

Адкрыты ў 1836. А.— бясколерны газ са слабым эфірным пахам, *t* пл. —80,8 °С, *t* кіп. —83,8 °С, шчыльн. 1,1716 *кг/м*³, добра растваральны ў ацэтоне. Сумесі з паветрам, якія маюць ад 2,3 да 81% А., выбухаюць ад іскры. А. вельмі рэакцыяздольны. Пры прапусканні яго праз амінічныя растворы вокісу серабра і закісу медзі ўтвараюцца ацэтыленіды (Ag_2C_2 і Cu_2C_2), якія ў сухім стане выбухаюць ад удару, іскры і г. д.

У прамысл. А. атрымліваюць з прыродных газаў і нафтавай сыравіны (электракрэкінгам і тэрмаакісляльным піролізам метану і яго гамолагаў), а таксама раскладаннем карбіду кальцыю (CaC_2) вадой. А. мае вялікае значэнне ў шматтаннажнай прамысл. арганічнага сінтэзу, з'яўляецца сыравінай для атрымання важных арган. злучэнняў: хларапрэну, ацэтальдэгіду, воцатнай к-ты, воцатнага ангідрыду, акрыланітрылу, вініл-хларыду і інш. Ужываецца ў газавай зварцы і рэзцы металаў. Макс. т-ра кіслародна-ацэтыленавага полымя 3150 °С. Перавозяць і трымаюць А. у запоўненых паздраватай масай стальных балонах у растворы ацэтону пад ціскам 15—17 *ат*.

Літ.: Химия и технология продуктов органического синтеза, М., 1966; Стрижевский И. И. Технологические основы и безопасность производства газообразного и растворенного ацетилена, Л., 1968. *В. В. Кахомская.* Мінск.

АЦЭТЫЛХАЛІН, $CH_3COOCH_2CH_2NOH(CH_3)_3$, складаны эфір азоцістай асновы халіну і воцатнай кіслаты. Бясколерныя крышталі, растваральныя ў вадзе, спірце і інш. растваральніках. Фізіял. значэнне А. высветлена О. Лёві (1921). Ёсць у тканках чалавека, пазваночных і многіх беспазваночных жывёл.

А.— хім. перадатчык нервовых імпульсаў у месцах сутыку нервовых валокнаў з нервовымі клеткамі (сінапсах) парасімпатычнай нервовай сістэмы, у *гангліях* вегетатыўнай нервовай сістэмы. Бесперапынна сінтэзуецца з дапамогай ферменту халінацэтылазы, а разбураецца з дапамогай халінэстэразы. Уведзены ў арганізм А. паслабляе сардэчную дзейнасць, запавольвае пульс, узмацняе дзейнасць гладкай мускулатуры бронхаў, страўніка, маткі і інш. *М. Ф. Меражынскі.* Мінск.

АЦЯПЛЁННЕ, сістэма для абагрэву памяшканняў. Адрозніваюць мясцовыя і цэнтральныя сістэмы А. Мясцовая: *пячное ацяпленне, электрычнае ацяпленне,* газавае, з выкарыстаннем ацяпляльна-вентыляцыйных агрэгатаў. Цэнтральная: *вадзяное ацяпленне, паравое ацяпленне, паветранае ацяпленне, панельнае ацяпленне, прамянёвае ацяпленне.* Пры мясцовым А. крыніцы цяпла знаходзяцца ў памяшканнях, якія ацяпляюць; пры цэнтральным у памяшканнях размяшчаюць награвальныя прылады, а цепланосьбіты (напр., вада) падаюцца з цэнтр. крыніцы (раённая кацельная ці цеплаэлектрацэнтраль). Цэнтральнае А. можа быць і ў аднакватэрным доме, тады водапагрэўны кацёл ставіцца ў падсобным памяшканні ці на кухні. Цеплавая магутнасць установак выбіраецца ў залежнасці ад прызначэння памяшканняў і сярэдняй знадворнай т-ры самай халоднай пяцідзённі ў пэўнай мясцовасці (для Масквы —26, для Мінска —22 °С). Жылыя памяшканні павінны мець 18 °С, глядзельныя залы 16 °С і г. д. Гл. таксама *Цеплазабеспячэнне.*

АЦЯПЛЯЛЬНЫ АГРЭГАТ, прылада для паветранага ацяплення прамысловых памяшканняў. Складаецца з вентылятара, паветранагравальніка (каларыфера), электрарухавіка, фільтраў, кажуха. Цеплаеносьбіт каларыфераў стацыянарных А. а. — перагрэтая вада

ці пара. Пераносныя агрэгаты ўжываюцца пераважна на будоўлі і могуць мець вогнепаветраныя каларыферы, у якіх выкарыстоўваецца газападобнае ці вадкае паліва. Патрубкі падаюць патрэбны кірунак патокам цёплага паветра. Калі паветра паступае ў А. а. не з памяшкання, а знадворку, ён наз. ацяпляльна-вентыляцыйным агрэгатам.

АЧА́Г (агнішча), 1) прыстасаванне, дзе распальваюць і аберагаюць агонь. Вядомы з перыяду ранняга палеаліту. Народы Пн звычайна рабілі А. пасярод памяшкання. У народаў Зах. Еўропы на аснове А. ўзнік камін; у народаў Усх. Еўропы ў 3—2-м тысячагоддзях да н. э. А. замяніла печ. У стараж. грэкаў, рымлян, германцаў, славян і інш. А. лічыўся свяшчэнным месцам сямейных культаў і абрадаў. Выкарыстоўваўся пры выплаўцы руды, абпальванні ганчарных вырабаў. 2) Крыніца, з якой што-н. пашыраецца, месца лакалізацыі чаго-н. Напр., А. землетрасення, А. інфекцыі (інвазіі).

АЧА́КАЎСКАЯ ЖО́ЎТАЯ, сорт слівы, адзін з асноўных у БССР. Плады сярэдняй велічыні, даўгаватыя, з баразёнкай, звужаныя да асновы. Выспяваюць у другой пал. жніўня. Скурка светла-жоўтая, з белаватым налётам, мякаць жоўта-зялёная, сакаўная, салодкая. Вызначаецца высокай зімастойкасцю, ураджайнасцю, устойлівасцю да грыбных хвароб. Пладаносіць на 4—5-ы год, у 19 гадоў дае ў сярэднім 25 *кг* пладоў з дрэва. Апыляльнікі: *Венгерка звычайная* і *Віктарыя.* Гл. іл. на ўкл. да арт. *Слівa.*

АЧАПО́ЎСКІ Міхал (11.5.1788, в. Пацейкі каля Навагрудка — 9.1.1854), вучоны-глебазнавец. Д-р філасофіі (1812). Праф. Віленскага ун-та (1822—32). Скончыў фіз.-матэм. ф-т Віленскага ун-та. У 1812—19 на тэрыторыі Зах. Літвы і Паўн. Польшчы ўкараняў прагрэс. метады вядзення с. гасп. У 1819—22 вывучаў сістэмы гаспадарання ў краінах Зах. Еўропы. Выдаў кнігі «Пра глебу, яе апрацоўку і догляд гаспадарчых раслін» (была падручнікам у школах Беларусі і Літвы) і «Спосаб класіфікацыі глебаў» (абедзве ў 1825). У 1828—30 на матэрыялах Беларусі і Літвы напісаў двухтомную працу «Погляд на сучасны стан гаспадаркі з паўночным кліматам». У 1834—53 дырэктар агранамічнага ін-та ў Марымонце (пад Варшавай). Найб. значная праца А.— «Сельская гаспадарка» (т. 1—10, 1835—44; т. 11—12, 1857).

АЧКІНА Рыта Мікалаеўна (н. 2.2.1938, Магілёў), майстар спорту міжнароднага класа па лыжным спорце. У 1960 скончыла Беларускі ін-т фізкультуры. Неаднаразовая пераможца пяршынстваў БССР, чэмпіёнка СССР (1965). На першынстве свету ў Холменколене (Нарвегія, 1966) заваявала тытул чэмпіёнкі ў эстафеце 3×5 *км* і бронзавы медаль на дыстанцыі 5 *км.* На X зімовых Алімпійскіх гульнях у Грэноблі (1968) заняла 3-е месца (эстафета 3×5 *км*).

АЧО́СА, рака, правы прыток р. Іпуць. Даўж. 26 *км.* Цячэ ў Веткаўскім і Добрушскім р-нах Гомельскай вобл. і Навазыбкаўскім р-не Бранскай вобл. РСФСР. Вадазбор (232 *км*²) у асноўным плоскі. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,97 *м*³/*сек.*

АЧЫ́ЖА, вёска ў Грабянецкім с/с Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Грабянецкі». За 16 *км* на Пд ад Чэрвеня, 79 *км* ад Мінска, 28 *км* ад чыг. ст. Градзянка. 300 ж., двароў 91 (1970). Пільня, майстэрня для рамонту с.-г. тэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У Айч. вайну ў ваколіцах А. базіраваліся партыз. брыгады У. А. Ціхамірава, «За Радзіму», «Чырвоны сцяг» і інш. У маі 1944 гітлераўцы спалілі вёску і 160 жыхароў. Помнік-абеліск сав. воінам і партызанам.

АЧЫСТКА ВАДЫ, гл. *Водападрыхтоўка.*

АЧЫСТКА ПАВЕ́ТРА, выдаленне з паветра часцінак пылу, пілавіння, валокнаў, газаў і інш. рэчываў. Прыточнае паветра, якое падаецца ў памяшканні або ў рухавікі ўнутр. згарання, ачышчаюць пылаўлоўнікамі і *фільтрамі.* Адпрацаванае паветра ачышчаецца ў пылаасадачных камерах, цыклонах, *адсорберах* і *абсорберах.*

АЧЫСТКА СЦЁКАВЫХ ВОДАЎ, апрацоўка сцёкавых водаў, каб засцерагчы ад іх шкоднага ўздзеяння вадаёмы, глебу, падземныя воды, паветра, а разам з тым людзей, жывёлу, рыбу, расліны. У сцёкавых водах ёсць мех. прымесі (папера, анучы, косці, валакно, пясок і інш.), а таксама забрудненні ў выглядзе суспензій, эмульсій (часцінкі большыя за 0,1 *ммк*), калоідаў (часцінкі памерам 0,1—0,001 *ммк*) і растваraў. Пры А. с. в. канцэнтрацыя ў вадзе рэчываў, што забруджваюць яе, паніжаецца да ступені, якая не парушае санітарнай нормы якасці вады ў вадаёмах. Арган. забрудненні, асабліва фізіял. выдзяленні чалавека і жывёлы, небяспечныя тым, што спрыяюць (праз крыніцы водазабеспячэння) узнікненню страўнікава-кішачных і інш. інфекцыйных хвароб. А. с. в. прадугледжвае таксама выдзяленне з іх кашт. рэчываў (нафтапрадуктаў, тлушчу, валакна і інш.), якія выкарыстоўваюцца ў адпаведных вытворчасцях ці ідуць на ўгнойванне палёў.

Адрозніваюць ачыстку гасп.-бытавых і прамысл. сцёкавых водаў. Гасп.-бытавыя воды ачышчаюць мех. ці біяхім. (біялагічным) спосабам. Мех. ачыстка бывае самастойная або папярэднічае інш. спосабам ачысткі. Збудаванні мех. ачысткі маюць рашоткі, пескалоўкі, тлушчалоўкі і адстойнікі розных відаў, фільтры. Біяхімічная А. с. в. патрабуе наяўнасці кіслароду (паветра) для акіслення арганічных злучэнняў, прадуктаў іх распаду і для падтрымання жыццядзейнасці мікраарганізмаў, за кошт якіх адбываецца мінералізацыя забруджванняў (ператварэнне іх у мінеральныя незагнівальныя злучэнні — напр., у солі азотнай кіслаты ці вугленкіслаты). Яна робіцца ў прыродных умовах (на палях арашэння і фільтрацыі) або на штучных збудаваннях — у аэрафільтрах, *аэратэнках,* біяфільтрах, дзе дзейнасць мікраарганізмаў інтэнсіфікуецца. Аэратэнкі найбольш часта ўжываюцца ў вялікіх каналізацыйных збудаваннях (станцыях аэрацыі). Рэшткі, якія аселіў адстойніках, перамяшчаюцца ў метатэнкі, дзе перагніваюць, а потым падсушваюцца на адкрытых земляных пляцоўках ці ў сушылках і выкарыстоўваюцца на ўгнаенне. Пасля ачысткі вада абеззаражваецца ў хларатарных ці кантактных ба-

сейнах (дэзінфектарах). Спосаб ачысткі вытворчых сцёкавых водаў вызначаецца ў залежнасці ад іх колькасці і саставу. Сцёкавыя воды, забруджаныя пераважна нерастваральнымі мінер. прымесямі (пры рудаабагачэнні, пракатцы, апрацоўцы металу і інш.), падлягаюць толькі мех. ачыстцы (адстойванню); кіслота- і шчолачазмяшчальныя сцёкавыя воды — хім. ачыстцы (нейтралізацыі); сцёкавыя воды з вялікай колькасцю арган. рэчываў (на тэкст. ф-ках, мясакамбінатах, малаказаводах і інш.) — механа-хім. і біяхім. ачыстцы; сцёкавыя воды некаторых вытворчасцей хім. прамысловасці — спец. ачыстцы (сорбцыі, флатацыі, каагуляцыі, іоннаму абмену і інш.). Ваду з радыеактыўнымі забрудненнямі не спускаюць у каналізацыю, робяць замкнёныя зваротныя цыклы водазабеспячэння і дэзактывацыю ў самой вытворчасці. Часам радыеактыўныя сцёкавыя воды разводзяць іншымі водамі і тым самым паніжаюць канцэнтрацыю да бяспечнай. Вытв. сцёкавыя воды, асабліва тыя, у якіх ёсць арган. забрудненні, звычайна ачышчаюць разам з гасп.-бытавымі водамі на агульнагарадскіх ачышчальных збудаваннях. Ачышчаныя сцёкавыя паўторна выкарыстоўваюць у вытворчасці.

Літ.: Марей А. Н. Санитарная охрана открытых водоемов от загрязнения радиоактивными веществами, М., 1958; Марзеев А. Н. и Жаботинский В. М. Коммунальная гигиена, 3 изд., М., 1968; Шишкин З. Н. и др. Канализация, 2 изд., М., 1961.

АШКЕРЦ (Aškerc) Антон (9.1.1856, в. Главока — 10.6.1912), славенскі паэт-рэаліст. З беднай сялянскай сям'і. Быў свяшчэннікам (1881—98). Першая кн. «Балады і рамансы» (1890). У эпічных творах (балады, сатыры, паэмы) паказвае вясковае жыццё («Вяселле ў Логах», «Камень на мяжы»), паэтызуе сялянскі вызв. рух мінулага (цыкл «Старая праўда»). Выступае супраць манарх. дэспатызму і захопніцкіх войнаў («Новыя вершы», 1900), адстойвае адзінства славян у барацьбе за свабоду. Наведаў многія краіны Еўропы, у т. л. Расію (1901—02), удзельнічаў у выданні анталогіі рус. паэзіі (1901). Свабадалюбтэмы («Мучанікі», 1906; «Героі», 1907). Пісаў таксама п'есы і лірычныя вершы.

АШМАРЫН Вітольд Францавіч (1882—сак. 1930), прафесіянальны рэвалюцыянер, савецкі партыйны дзеяч, журналіст, чэкіст. Чл. КПСС з 1902. У рэвалюц. рух уключыўся гімназістам. У 1902—04 адбываў ссылку ў Сібіры. У 1905—17 вёў рэвалюц. работу ў прамысл. раёнах Расіі. З 1918 на Беларусі: сакратар ВРК БССР, чл. Прэзідыума і сакратар ЦВК БССР (кастр.—снеж. 1920), чл. Кантрольнай камісіі КП(б)Б (ліст. 1920—жн. 1921), рэдактар газ. «Звезда», арганізатар і першы кіраўнік Беларускага аддзялення Рас. тэлегр. агенцтва, чл. калегіі Дзярж. выд-ва БССР (1921). Адначасова працаваў у Надзвычайнай камісіі Беларусі, потым у Маскве ў Аб'яднаным Дзярж. паліт. управленні (АДПУ) пры СНК СССР. З 1924 у ЦК ВКП(б).

М. І. Камінскі. Мінск.

АШМЯНКА, рака, левы прыток Вілii. Даўж. 105 *км*. Пачынаецца на Ашмянскім узвышшы, цячэ ў Ашмянскім, Смаргонскім і Астравецкім р-нах Гродзенскай вобл. Самы вялікі прыток Лоша (60 *км*). Вадазбор (1490 *км²*) градава-марэнны, глебы сугліністыя, у паніжэннях супясчаныя. Каля 1/5 вадазбору займае лес, найбольш хваёвы. Жыўленне ракі мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 12,8 *м³/сек*. У ніжнім цячэнні А. пабудаваны ГЭС магутнасцю больш за 1000 *квт*.

АШМЯНСКАЕ ЎЗВЫШША, буйнаўзгорыстыя раён у паўн.-зах. частцы БССР на Пд ад чыгункі Маладзечна — Вільнюс. Абсалютныя вышыні А. ў. дасягаюць 320 *м* (г. Мілідаўская). Над суседнімі нізінамі ўзвышаецца да 150 *м*. А. ў. — водападзел паміж сістэмай Вілii (р. Ашмянка) і Нёмана (нёманская Бярэ-



Рака Ашмянка каля в. Жупраны.

зіна). Утварылася ў перыяд адступання дняпроўскага ледавіка. Гэта складаная сістэма канцовамарэнных град (да 5), з марэнных суглінкаў і супескаў. Найвыш. пункты — высокія купалападобныя ўзгоркі з круглаватымі вяршынямі. Сустракаюцца камавыя ўзгоркі, складзеныя з дробнаазярністых слаістых пяскоў. У сярэдняй частцы А. ў. сустракаюцца пакатахвалістыя ўчасткі з лёсападобнымі суглінкамі. Каля рэк А. ў. мае адносныя выш. 50—70 *м*, значна падзелена ярамі і лагчынамі. А. ў. прарэзана дзвюма скразнымі далінамі рэк Ашмянкі — Гальшанкі і нёманскай Бярэзіны, што ўтварыліся пры спуску вады з ледавіковых азёраў, якія існавалі на ПнУ. Глебы дзярнова-падзолістыя, у далінах алювіяльныя і балотныя. На схілах хваёвыя лясы, трапляюцца мяшаныя і ялова-хваёвыя; у паніжэннях — бярозава-асінавыя з прымессю вольхі і вярбы. Пад ворывам каля 60% тэрыторыі.

В. П. Якушка. Мінск.

АШМЯНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП. Пашырэнне марксізма сярод перадавых рабочых і інтэлігенцыі Ашмян пачалося ў 90-я г. 19 ст. С.-д. работу ў Ашмянах вялі чл. Віленскай арг-цыі РСДРП. Прапаганда с.-д. ідэй узмацнілася пасля з'яўлення ленінскай «Искры», асабліва ў сувязі з паведамленнем газеты (№ 6 і 7) пра выступленні сялян 32 вёсак Ашмянскага пав. летам 1901. А. а. РСДРП створана ў канцы 1904. У 2-й пал. 1905 яна ўвайшла ў склад Віленскай акругавай арг-цыі РСДРП. Чл. арганізацыі вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва, арганізоўвалі мітынгі, дэманстрацыі, сходы, выпускалі лістоўкі. 21.7.1905 яны арганізавалі сход ашмянскіх рабочых (прысутнічала каля 300 чал.), які закончыўся дэманстрацыяй; напярэдадні 1 мая 1906 правялі 4 такія сходы, выпусцілі лістоўкі-звароты да прафсаюза гарбароў, да навучэнцаў. Арг-цыя мела сувязі з Лідскай, Смаргонскай, Свянцянскай,

Гродзенскай арг-цыямі і Паўн.-Зах. камітэтам РСДРП. У чэрв. 1906 А. а. РСДРП налічвала 145 чл., якія ўваходзілі ў гарадскую і рамесніцкую сходкі; існавалі салдацкая група, а таксама 7 гурткоў, 5 з якіх — заводскія. Прадстаўнікі А. а. РСДРП прысутнічалі на 1-й і 3-й канфер. Віленскай акруговай арг-цыі РСДРП (18.1.1906 і 11—12.6.1906), на з'ездзе Паўн.-Зах. саюза РСДРП (28 мая — пач. чэрв. 1906). У перыяд рэакцыі арг-цыя разгромлена; чл. А. а. РСДРП, якія пазбеглі арышту, падтрымлівалі сувязь з Віленскай арг-цыяй РСДРП. Парт. арг-цыя ў Ашмянах адноўлена пасля Кастр. рэвалюцыі. Яна дзейнічала і ў перыяд акупацыі Беларусі кайзераўскімі войскамі. Прадстаўнік Ашмянскай парт. арг-цыі прысутнічаў на 1-й падпольнай канферэнцыі РКП(б) Мінскага раёна (15.7.1918).

Кр.: Хроника важнейших событий истории КПБ, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962.


У. І. Салашэнка. Маглёў.

АШМЯНСКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ імя Ф. Багушэвіча, створаны ў 1955 у г. Ашмяны Гродзенскай вобл. Мае 10 экспазіцыйных залаў, дзе размешчана 1264 экспанаты асн. фонду (усяго 3317 экспанатаў, 1970). У музеі шырока пададзены матэрыялы археал. раскопак, дакументы, фотаздымкі, рэчавыя экспанаты, якія расказваюць пра геалогію, флору і фаўну роднага краю, гісторыю Ашмян і раёна ад стараж. часоў да нашых дзён. Большасць экспанатаў адлюстроўвае дасягненні працоўных раёна за гады Сав. улады, рэвалюц. барацьбу за сацыяльнае і нац. вызваленне ў перыяд панавання бурж. Польшчы, гераічную барацьбу з фаш. захопнікамі ў Айч. вайну. У асобнай зале матэрыялы пра жыццё і творчасць выдатнага бел. пісьменніка-дэмакрата, удзельніка паўстання 1863 Францішка Багушэвіча, які доўгі час жыў і пахаваны ў Ашмянскім р-не. Пры А. к. м. ёсць б-ка, супрацоўнікі музея вядуць навук. работу, археал. раскопкі на тэр. раёна.


М. А. Бельчыкоў. Ашмяны.

АШМЯНСКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны ў паўн.-ўсх. частцы вобл. Пл. 1,2 тыс. *км²*. Нас. 43,6 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 12 сельсаветаў. Цэнтр — г. *Ашмяны*.

Тэрыторыя А. р. ў цэнтр. частцы *Ашмянскага ўзвышша*. Выш. да 300 *м*. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу — 15,5 млн. *т* (Мікулішкі 10,7 млн. *т*, Карвелішкі 4,8 млн. *т*), 5 радовішчаў пясчана-жвіровага матэрыялу — 9,2 млн. *м³* (Баруны 7,2 млн. *м³*), 2 радовішчы цагельных глін — 0,5 млн. *м³* (Загорнікі 0,4 млн. *м³*). Сярэдняя т-ра студз. ад —6,0 да —6,5 °С, ліп. 17,5—18 °С. Ападкаў каля 600 *мм* за год. Вегет. перыяд 190 дзён. Па тэр. раёна цякуць рэкі Ашмянка (прыток Вілii) і Гальшанка (прыток Бярэзіны). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (73%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (16%), дзярнова-балотныя (7%), тарфянабалотныя (4%). З мінеральных глебаў 83,8% сугліністых, 14,2% супясчаных, 2,0% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных




Ашмянскі торфабрыкетны завод.





Адгрузка аміячнай вады на Ашмянскай базе «Сельгастэхніка».

хайлоўшчына), «Свабода» (Кракоўка), імя Суворава (Дзбесі), «Сцяг Савета» (Цудзенішкі), «30 год БССР» (Мураваная Ашмянка), «Ударнік» (Талмінава), «Ураджай» (Каменны Лог), «Чырвоны сцяг» (Крайванцы), «Шлях да камунізма» (Габрыялайшчына), «Ясная паляна» (Будзёнаўка). Саўгасы і іх цэнтры: «Баруны» (Баруны), «Гальшаны» (Гальшаны), «Гарэцкаўшчына» (Гарэцкаўшчына), «Гінеўцы» (Гінеўцы), «Перамога» (Новікі).



Клуб калгаса «Свабода» ў в. Кракоўка.

Пад с.-г. ўгоддзямі каля 50% тэр. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1968) 46,6, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 20,8, тэхнічнымі 3,1, бульбай 6,2, кармавымі 16,2. Са збожжавых пераважна сеюць жыта, ячмень, пшаніцу, авёс, грэчку. Аснoўная тэхн. культура — лён-даўгунец. Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. У 1970 было (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 35,8 (у т. л. кароў 17,8), свіней 32,2, авечак і коз 5,3. Асн. від транспарту аўтамабільны. На пач. 1970 ў А. р. было 11 сярэдніх, 24 васьмігадовыя, 44 пачатковыя, 2 школы рабочай моладзі, 3 школы-інтэрнаты, 8 дашкольных устаноў; с.-г. тэхнікум, сельскае прафесіян.-тэхн. вуч., муз. школа, 29 клубаў, 53 кінаўстаноўкі, у т. л. 33 стацыянарныя, 43 масавыя б-кі, 4 бальніцы, 23 фельч.-ак. пункты. На 1.1.1970 у раёне працавала 575 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 53 інжынеры, 30 аграномаў, 46 урачоў, 213 настаўнікаў; 1315 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Паблізу ст. Ашмяны санаторый. У Жупранах магіла пісьменніка Ф. Багушэвіча. Раённая газета «Красное знамя».

І. І. Трухан. Мінск.

АШМЯНЦЫ, вёска ў Жалудоцкім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. на р. Лебяда. Цэнтр калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 30 *км* на У ад Шчучына, 98 *км* ад Гродна, 15 *км* ад чыг. станцыі Скрыбаўцы. 351 ж., двароў 91 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, магазін.

АШМЯНЫ, горад, цэнтр Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. На р. Ашмянка (бас. Нёмана). За 220 *км* на ПнУ ад Гродна, 17 *км* ад чыг. ст. Ашмяны (на лініі Маладзечна — Вільнюс). Аэрапорт. 10,3 тыс. ж. (1970).

Першыя пісьмовыя звесткі пра А. адносяцца да 1384—85, калі яго жыхары паспяхова адбілі напад тэўтонскіх рыцараў. У 1435 тут былі разбіты войскі, якія *Свідрыгайла* сабраў для барацьбы з *Жыгімонтам Кейстутавічам*. У час праўлення Жыгімонта II Аўгуста горад атрымаў магдэбургскае права. Двойчы (у 1519 і 1655) быў заняты рус. войскамі. З 1569 цэнтр староства ў Віленскім ваяводстве. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) стаў пав. цэнтрам Віленскай губ. К канцу 19 ст. ў горадзе было 10 прадпр. для перапрацоўкі с.-г. сыравіны (4 гарбарныя, вінакурны, мінеральных водаў, мёдаварны, соладаварны з-ды, тытунёвая ф-ка, млын), на якіх працавалі 382 рабочыя. Жыхароў налічвалася ў 1811 — 1830 чал., 1863—3317, 1897 — 7200, 1914 — 8200. Працоўныя А. актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюц. руху. У 1904 створана *Ашмянская арганізацыя РСДРП*. У час рэвалюцыі 1905—07 у горадзе неаднойчы праводзіліся ўсеагульныя забастоўкі. У 1921—39 А. ўваходзілі ў склад бурж. Польшчы, пав. цэнтр Віленскага ваяводства. У горадзе дзейнічалі падпольныя арг-цыі КПЗБ і КСМЗБ; з 1929 — падпольны райком КПЗБ. Пасля вызвалення Зах. Беларусі (вер. 1939) уз'яднаны з БССР. У 1939—44 раённы цэнтр Вілейскай, у 1944—58 — Маладзечанскай, з 1958 — Гродзенскай вобл. З чэрв. 1941 да ліп. 1944 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі і вельмі разбураны.

За гады Сав. улады створаны прамысл. прадпрыемствы: мясакамбінат, ільнозавод, масласырзавод, дражджавы, харч. канцэнтратаў, хлебапякарны з-ды. Цэнтр. вуліца — Савецкая. Тут асноўныя навуч. і культурныя ўстановы, гандлёва-бытавыя прадпрыемствы. 2 сярэднія школы, школа рабочай моладзі, сярэдняя школа-інтэрнат, муз. і дзіцячая



Ашмяны. Від на горад.

спарт. школы, 3 дашкольныя ўстановы, с.-г. тэхнікум, сельскае прафесіян.-тэхн. вуч., Дом культуры, кінатэатр, 4 б-кі, бальніца, *Ашмянскі краязнаўчы музей*.

АШПЕРГЕРЫ, польскія акцёры.

1) Войцех А. (Aszperger; 1790, Вільня — 1847). Вучыўся ў Віленскай гімназіі. Пасля

вайск. службы стаў прафесіян. акцёрам. Выступаў пераважна ў камедыях А. Фрэдры. Гастраліраваў на Беларусі: Віцебск (1810), Мінск (1836, 1837, 1839).

2) Анеля А. (Aszpergerowa; дзявочае Камінская; 29.11.1816, Варшава — 27.1.1902). Жонка Войцеха А. Скончыла драм. школу ў Варшаве, дэбютавала ў т-ры «Размаітосці» (1835). Выступала ў Вільні, Мінску. З 1841 актрыса «Тэатра Львоўскага». Выконвала ролі субрэтак, гераінь, потым — трагедыйныя і ролі маці. Лепшыя: лэдзі Макбет, місіс Пэйдж («Макбет», «Віндзорскія свавольніцы» У. Шэкспіра), Марыя Сцюарт, Ідалія («Марыя Сцюарт», «Фантазіі» Ю. Славацкага).


Літ.: Pepłowski S. Siły sceny Lwowskiej: Dramat i komedia, Lwów, 1887.

АШРАФІ Мухтар Ашрафавіч [н. 29.5(11.6). 1912, Бухара], узбекскі савецкі кампазітар і дырыжор. Нар. арт. СССР (1951). Чл. КПСС з 1941. Праф. Ташкенцкай кансерваторыі з 1953. Адзін з першых увёў ва узб. музыку буйныя сімф. формы. Сімфоніі «Гераічная» (1942; Дзярж. прэмія СССР 1943) і «Слава пераможцам» (1944) апіраюцца на нац. фальклор, трактаваны ў драм. і лірыка-драм. плане. Аўтар 4 опер, у т. л. «Буран» (1938, з С. Васіленкам) і «Дыларом» (1957); кантат, у т. л. «Песня пра шчасце» (1951; Дзярж. прэмія СССР 1952); 7 сімф. сюіт; апрацовак нар. песень і інш. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

АШХАБА́Д (б. Асхабад, з 1919 да 1927 Палтарацк), сталіца Туркменскай ССР (з 1924). Размешчаны ў перадгор'ях Капетдага. Чыг. ст. на лініі Краснаводск — Ташкент. 253 тыс. ж. (1970).

А. заснаваны на месцы стараж. паселішча у 1881 пад назвай Асхабад (ад аднайменнага суседняга аула) як ваеннае ўмацаванне, пазней цэнтр Закаспійскай вобл. Росту горада спрыяла буд-ва чыгункі: А.— Каспій (1885) і А.— Ташкент (1899). С.-д. арг-цыі і салдацкі к-т РСДРП аформіліся ў 1905. У снеж. 1905 у А. адбылася 1-я Закаспійская канфер. РСДРП. 5.6.1906 успыхнула паўстанне асхабадскага гарнізона і чыгуначнікаў, якое праз тыдзень было жорстка задушана. У сак. 1917 утвораны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Сав. ўлада ўстаноўлена ў снеж. 1917. У чэрв. 1918 уладу захапілі эсэры і белагвардзейцы, якія 22.7.1918 каля ст. Анау расстралялі 9 асхабадскіх камісараў і камандзіраў Чырв. Арміі. У ліп. 1919 А. вызвалены сав. войскамі.

У 1915 у А. было 68 паўсаматужных прадпр. з 200—300 рабочымі. За гады Сав. улады горад з адм.-гандл. цэнтра ператварыўся ў буйны прамысл. цэнтр Туркм. ССР. У А. развіта машынабудаванне і металаапрацоўка (вытворчасць прамысл. абсталявання, у т. л. нафтавага на з-дзе «Ашнафтамаш», с.-г. машын, бытавых прылад, рамонт аўтамашын, цеплавозаў), прамысловасць эл.-тэхнічная (з-д «Туркменкабель»), буд. матэрыялаў, шкляная, тэкстыльная (баваўняная, шаўковая, дывановая), харчовая (мясная, вінаробная, мукамольная і інш.). Палігр. камбінат, кінафабрыка. Дзве дызельныя эл. станцыі, каля А. паратурбінная эл. станцыя. Пабудаваны (1969) газаправод Майскае — А.— Безмеін. У 1962 да горада падведзены Каракумскі канал імя Леніна. А. няраз разбуралі землетрасенні (1893, 1929, 1948), таму забудова вядзецца з улікам сейсмічнасці зоны. Планіроўка прамавугольная ў спалучэнні з радыяльнай.



Ашхабад. Будынак Савета Міністраў.

У 1968/69 навуч. г. ў горадзе было 70 агульнаадук. школ усіх відаў, 12 сярэдніх спец. навуч. устаноў, 4 ВНУ: Туркм. ун-т імя М. Горкага, політэхнічны, с.-г. і мед. ін-ты. У А. працуюць (1968): АН Туркм. ССР, 8 НДІ, 4 т-ры (оперы і балета імя Махтумкулі, Туркм. акад. т-р драмы імя Малапепеса, рус. драм. т-р імя Пушкіна, т-р юнага гледача), філармонія, 38 б-к, 14 клубных устаноў, 3 музеі. Гар. газ. «Вечерний Ашхабад». У 1969 у А. было 32 бальнічныя ўстановы на 4270 ложкаў, 1735 урачоў усіх спецыяльнасцей, 2 дыспансеры, 3 сан.-эпід. станцыі.

Літ.: Клычев А. и Норманд В. Л. Ашхабад и его будущее, Ашхабад, 1963; Жмуйда В. Б. Ашхабад, М., 1957.

АШЧА́ДНАЯ КА́СА, крэдытная ўстанова, якая прымае і хавае грашовыя зберажэнні ў выглядзе *ўкладаў грашовых*. У БССР на 1.1.1970 грашовыя ўклады насельніцтва ў А. к. склалі 1 млрд. 112 млн. руб. У параўнанні з 1940 уклады насельніцтва павялічыліся ў 63,9 раза. За гэты перыяд сярэдняя велічыня ўкладу выраслa ў 12,5 раза.

У буйн. капіталіст. краінах узніклі ў канцы 18 — пач. 19 ст.; у Расіі ў 1841, на Беларусі ў 1863. У СССР створаны ў адпаведнасці з пастановай СНК ад 26.12.1922. Падпарадкаваны Дзяржбанку СССР. На 1.1.1970 у СССР налічвалася 77,7 тыс. А. к., у т. л. у БССР 3086. А. к. выконваюць усе аперацыі па Дзярж. 3% унутранай пазыцыі: прадаюць, купляюць, прымаюць на зберажэнне аблігацыі; выдаюць і аплачваюць акрэдытывы; выплачваюць выйгрышы, персанальныя пенсіі і дзярж. дапамогі многадзетным і адзінокім маці; прымаюць плату за кватэры і выконваюць інш. аперацыі. У сацыяліст. краінах арганіз. структура А. к. і ўклады розныя. У Балгарыі, Польшчы, Румыніі А. к. прымаюць пераважна імянныя ўклады. У Венгрыі, ГДР, Чэхаславакіі пашыраны ашчадныя кніжкі на прад'яўніка. А. к. гэтых краін выдаюць насельніцтву пазыкі на жыллёвае буд-ва і на інш. спажывецкія патрэбы, рэалізуюць аблігацыі дзярж. пазык.

У капіталіст. краінах галоўная функцыя А. к. — ператварэнне грашовых накапленняў у *пазыковы капітал*. Асн. ўкладчыкі — дробн-

ная і сярэдняя буржуазія; укладваюцца капіталы, якія не выкарыстаны ў вытворчасці, гандлі. Зберажэнні прац. мас невялікія, яны ўтвараюцца за кошт абмежавання патрэб і адкладваюцца на выпадак беспрацоўя, хваробы і г. д. У перыяд агульнага крызісу капіталізму большую частку ўкладаў дзяржава выкарыстоўвае на фінансаванне ваенных расходаў. *М. А. Касцюковіч.* Мінск.

АШЧУПНІКІ (Pselaphidae), сямейства насякомых атрада жорсткакрылых, або жукоў. Даўж. 0,8—3,5 *мм*. Колер рудавата-жоўты, іржава-чырвоны або буры. Надкрылы ўкарочаныя, 5—8 нерухомых членікаў брушка няўкрытыя. Калі поўзаюць, варушаць вусікамі, быццам абмацваюць рэчы перад сабой. Вельмі пашыраныя. Вядома каля 4000 відаў, у Еўрап. частцы СССР да 80 відаў. Жывуць у вільготных месцах, пад апалым лісцем, пад карой дрэў, пад камянямі, у пнях, пячорах, многія ў мурашніках. Кормяцца арган. рэшткамі. Некаторыя драпежнікі.

АШЫРАЎ Сейткасым (н. 7.11.1924, с. Кагам Шаульдэрскага р-на Чымкенцкай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1945. На фронце сяржант А. камандаваў аддзяленнем разведчыкаў. Вызначыўся ў час прарыву абароны ворага пад Бабруйскам і ў час праследавання гітлераўцаў на Баранавіцкім напрамку (25.6—14.7.1944). Жыве ў Чардарынскім р-не Чымкенцкай вобл.

АШЭЛЬСКАЯ КУЛЬТУРА, ніжнепалеалітычная культура, якая ў пачатку ледавіковага перыяду (400—200 тыс. гадоў назад) была пашырана ў Зах. і Паўд. Еўропе. На тэр. Беларусі трапляюцца асобныя крамяневыя прылады ашэльскай апрацоўкі.

Названа па месцы першых знаходак у Сент-Ашэле, прыгарадзе Ам'ена (Францыя). Плямёны А. к. былі на ранняй стадыі першабытнаабшчынлектыўнае палявanne. Асноўныя прылады: каменныя рубілы, скрэблы, востраканечнікі, адшчэпы трохвугольнай формы. У СССР паселішчы А. к. знойдзены на Пд: Сюрэнь у Крыме, пячоры Кударо і Лаша-Балта ў Асеціі, пад Жытомірам (УССР) і ў Малдавіі.

Літ.: Борисковский П. И. Начальный этап первобытного общества. Л., 1950.
У. Дз. Будзько. Мінск.

АЭРА... (грэч. aēr паветра), частка складаных слоў, якая вызначае адносіны да паветра, паветраплавання (напр., *аэралогія, аэрапорт*).

АЭРАВАКЗАЛ, гл. *Вакзал.*

АЭРАГЕАЗДЫМКА, метад геалагічнай здымкі і пошукаў карысных выкапняў з дапамогай комплекснага спалучэння *аэрафотаздымкі*, аэравізуальных назіранняў і наземных палявых работ.

А. вывучае залежнасць рэльефу, гідраграфіі, расліннасці, глебаў ад геал. будовы. Робіцца на выбраных кантрольных участках з мэтаю параўнання матэрыялаў аэрафотаздымкі з геал. будовай; гэта дае магчымасць дашыфраваць здымкі і скласці геал. карту. А. скарачае час і робіць больш таннымі геолагаразведачныя работы.

Літ.: Петрусевич М. Н. Аэрометоды при геологических исследованиях. М., 1962.

АЭРАДРОМ (*аэра...*+drómos месца для спаборніцтваў), комплекс збудаванняў і зямельны ўчастак з паветранымі падыходамі, прызначаныя для ўзлёту, пасадкі, стаянкі і абслугоўвання самалётаў. Адрозніваюць грамадзянскія і ваенныя А. Падзяляюцца на транспартныя, спец. карыстання, заводскія, вучэбныя, клубна-спартыўныя і запасныя.

На лётным полі размяшчаюцца адна ці некалькі ўзлётна-пасадачных палос, найчасцей з жалезабетону, даўж. ад 2000 да 4500 *м* і шыр. 30—80 *м*. Галоўная палоса робіцца ў кірунку пераважных вятроў. Да ўзлётна-пасадачных палос далучаюцца рулёжныя дарожкі і пляцоўкі для стаянкі самалётаў.

АЭРАДЫНАМІКА (*аэра...*+dýnamis сіла), навука пра законы руху газападобнага асяроддзя і яго сілавое ўзаемадзеянне з цвёрдымі целамі абцякальнай формы (крыло, падоўжанае цела вярчэння і інш.). Аснова тэарэт. А.— агульныя ўраўненні *гідрамеханікі*. Пры вырашэнні найбольш простых пытанняў (размеркаванне ціску і скарасцей вакол абцякальнага цела і інш.) выкарыстоўваецца набліжэнне ідэальнай вадкасці несціскальнай або сціскальнай пры малых і вялікіх скарасцях адпаведна. Наяўнасць вязкасці ў рэальных вадкасцях уносіць істотныя папраўкі ў А. ідэальных вадкасцей: узнікае супраціўленне, і размеркаванне ціску ўздоўж цела скажаецца *пагранічным слоем*. Вязкасць вадкасці ўлічваецца пры вывучэнні цеплаабмену целаў з патокам і пры вывучэнні цячэння паблізу паверхні целаў.


Акрамя ўласна А., развіліся яе спец. прыкладныя часткі: А. самалётаў (вывучае рух самалётаў цалкам), знешняя балістыка (даследуе палёт снарадаў), А. турбамашын і рэактыўных рухавікоў. Галіна неавіяцыйнага выкарыстання А. атрымала назву прамысловай А., да якой адносяцца тэорыя і разлік паветранадзімальных установак, ветравых рухавікоў, струменных апаратаў і інш. З вывучэннем руху целаў у моцна разрэджанай атмасферы ўзнікла супераэрадынаміка, а выкарыстанне дасягненняў *газавай дынамікі* ў авіяцыі і рэактыўнай тэхніцы прывяло да стварэння А. вялікіх скарасцей. У А. ўваходзіць аэрастатыка, якая вывучае раўнавагу газападобных асяроддзяў.

Эксперымент. А. з дапамогай *аэрадынамічных труб* вызначае лікавыя каэфіцыенты сіл і момантаў, якія дзейнічаюць на цела з боку газавага патоку. Пры вымярэнні размеркавання ціску ў патоках звышгукавых скарасцей карыстаюцца аптычнымі метадамі, якія ўлічваюць залежнасць паказчыка пераламлення святла ад шчыльнасці газу, а пры запісе пульсуючых скарасцей і ціскаў — электрычнымі метадамі.

Літ.: Жуковский Н. Е. Теоретические основы воздухоплавания. Собр. соч., т. 6, М.—Л., 1950; Фабрикант Н. Я. Аэродинамика. Общий курс, М., 1964; Исследования в области теплообмена и аэродинамики потоков, Мн., 1963.
Ю. В. Хадыка. Мінск.

АЭРАДЫНАМІЧНАЯ ТРУБА, установка, у якой ствараецца паток паветра з рэгуляваннем скарасці, каб вывучаць яго дзеянне на цвёрдыя целы (гл. *Аэрадынаміка*).

Прататып А. т. быў створаны ў 1897 К. Э. Цыялкоўскім, які скарыстаў паток паветра на выхадзе з цэнтрабежнага вентылятара. У 1902 М. Я. Жукоўскі пабудаваў пры Маскоўскім ун-це першую А. т. квадратнага сячэння (*м*) 0,75×0,75, у якой скорасць паветранага патоку дасягала 9 *м/сек*. Пазней А. т. ўдасканальваліся, павялічваліся памеры трубаў і мадэляў, павышаўся дынамічны ціск паветранага патоку.



Аэрадынамічная труба ў лабараторыі Інстытута цепла- і масаабмену АН БССР.

У А. т. рух цела адносна паветра замяняецца рухам паветра адносна нерухома замацаванага цела (прынцып абарачальнасці). Рух паветра звычайна ствараецца і рэгулюецца вентылятарам (у звышгукавых трубах — кампрэсарам). Мадэль або апарат падвешваюць на тонкіх стальных дратах ці замацоўваюць на трымалках у рабочай частцы трубы. Пад напорам паветранага патоку мадэль можа зрушвацца. Трымалкі злучаны з рычагамі аэрадынамічнай вагі, якія з дапамогай грузаў дазваляюць вярнуць мадэль у становішча раўнавагі. Па велічыні гэтых грузаў вызначаюць сілы і моманты, якія дзейнічаюць на мадэль, даследуюць размеркаванне ціску і інш. аэрадынамічныя характарыстыкі. У выніку выпрабаванняў мадэляў у А. т. вызначаюць найлепшыя формы лятальных апаратаў, караблёў, аўтамабіляў, цягнікоў, даследуюць іх устойлівасць і манеўранасць, вібрацыі, нагрузкі, якія ўзнікаюць пры руху, вызначаюць ветравыя нагрузкі на вышынныя будынкі, масты, мачты і інш. збудаванні. Умовы палёту лятальных апаратаў пры высокіх скарасцях вывучаюць у звышгукавых А. т. з павышаным ціскам паветра. Для выпрабавання вялікіх аб'ектаў (сячэннем да (*м*) 24×12) пры высокіх скарасцях паветранага патоку (да 25 *м/сек*) створаны А. т. магутнасцю да 300 тыс. *к. с.*

Літ.: Мартынов А. К. Экспериментальная аэродинамика, 2 изд., М., 1958; Мельников А. П. Аэродинамика больших скоростей, М., 1961.
М. Р. Канькоў. Масква.


АЭРАЗОЛІ (*аэра...*+лац. solutio раствор), дысперсныя сістэмы з дробных цвёрдых або вадкіх часцінак, якія знаходзяцца ў газавым асяроддзі (звычайна ў паветры). Калі часцінкі вадкія, А. называюцца туманам, калі цвёрдыя маленькія — дымам, калі большыя — пылам. Утвараюцца А. ў розных прыродных і вытворчых працэсах: каля вадаспадаў, пры кандэнсацыі перанасычанай пары, пры механічным драбленні і распыленні цвёрдых целаў, пры пэўных хім. рэакцыях і фіз. працэсах. А. шырока выкарыстоўваюцца ў медыцыне (інгаляцыя, дэзінфекцыя), с. гасп. (апыленне раслін інсектыцыдамі), ваеннай справе (дымавыя завесы), пры фарбаванні і металізацыі розных паверхняў. Аднак утварэнне А. часта непажаданае, напр., у металургіі, цэментнай, хім. і інш. галінах прамысл., дзе пыл выносіць каштоўныя рэчывы, забруджвае паветра і шкодна дзейнічае на здароўе людзей і механізмы. Важная фіз. праблема — разбурэнне А.: для ачысткі атмасферы, у метэаралогіі (штучнае дажджаванне, рассейванне туману).

АЭРАЛАГІЧНЫЯ ПРЫЛАДЫ, прылады для назірання за атмасферай па-за прыземным слоем. Найбольш пашыраны: 1) **шарыпілоты**, напоўненыя вадародам, якія вызначаюць кірунак і скорасць ветру да выш. 10—16 *км*; назіранне за палётам шара-пілота робіцца з дапамогай аэралагічных тэадалітаў; 2) **метэарографы**, самапісныя прылады, што рэгіструюць ціск, т-ру і вільготнасць паветра да выш. 10—16 *км*; падымаюць іх на шарах-зондах, самалётах, аэрастатах; 3) **радыёзонды**, якія вымяраюць аэралаг. элементы ў атмасферы і адначасова перадаюць вынікі з дапамогай радыёхваляў; найбольшая вышыня падымання 30—40 *км*. У больш высокія слаі А. п. падымаюць геафіз. і метэаралагічнымі ракетамі. *С. Л. Драгун.* Мінск.

АЭРАЛОГІЯ (*аэра...*+*...логія*), галіна метэаралогіі, якая вывучае высокія слаі атмасферы: састаў і яе будову, тэмпературны рэжым, паветраныя плыні на розных вышынях, воблакі і сувязь паміж працэсамі, якія адбываюцца ў атмасферы. Істотная частка А.— вучэнне пра метады даследавання свабоднай (па-за прыземным слоем) атмасферы і неабходныя для гэтага прылады. Гл. *Аэралагічныя прылады.*

АЭРАМАГНІТНАЯ ЗДЫМКА, метад вывучэння асаблівасцей магнітнага поля Зямлі, заснаваны на аўтаматычным вымярэнні вертыкальнай кампаненты або поўнай велічыні напружанасці магнітнага поля ў час палёту над тэрыторыяй даследавання.

Вымяраюць напружанасць магнітнага поля з дапамогай аэрамагнітометраў, устаноўленых на самалёце, па сістэме паралельных маршрутаў, раўнамерна размешчаных на тэрыторыі здымкі. Вынікам А. з. з'яўляюцца графікі змены верт. кампаненты напружанасці магнітнага поля па профілях і складзеныя з іх дапамогай карты з ізалініямі вымеранай велічыні.



Аэрамаяк: злева — рупарная антэна радыёмаяка, справа — святлотэхнічнае прыстасаванне.

Шырока ўжываецца пры складанні геал. карт, выяўленні і аконтурванні масіваў горных парод асн. саставу, пры пошуках жалезарудных радовішчаў.

АЭРАМАЯК, наземная святлосігнальная прылада, якая паказвае лётчыку знаходжанне аэрадрома пры начным палёце.

Пашыраны вярчальныя і неонавыя кодавыя А. Аптычная сістэма вярчальнага А. — дыскавыя лінзы ці парабалоідны шкляны адбівальнік, крыніца святла — лямпа напальвання ці эл. дуга. Неонавы кодавы А. абсталяваны неонавымі трубкамі і кодавым прыстасаваннем, якое дае магчымасць маркіраваць аэрадромы светлавымі літарамі па тэлеграфнай азбуцы. А. можна бачыць ноччу на адлегласці да 70 *км*. Гл. таксама *Маяк*.


АЭРАМЕТАДЫ, метады даследаванняў будовы зямной паверхні, верхняга слоя зямной кары, атмасферы, геаграфічнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў. Даследаванні праводзяцца ў працэсе палёту фатаграфаваннем, візуальна ці аўтам. запісам параметраў фізічных (эл.-магн., магнітнага, гравітацыйнага і інш.) палёў Зямлі з наступнай наземнай апрацоўкай атрыманых матэрыялаў. Фізічная сутнасць А. — вызначэнне залежнасці асаблівасцей гэтых палёў або іх кампанентаў (бачнае, інфрачырвонае і ультрафіялетавае выпрамяненні, гама-прамяні, радыёхвалі і інш.) ад будовы верхняга слоя зямной кары і асаблівасцей яе паверхні. У залежнасці ад выкарыстання віду фіз. поля (або выпрамянення) і спосабу назірання вылучаюцца *аэрафотаздымка, аэраэлектраразведка, аэрамагнітная здымка,* аэрагравіметрычная здымка, аэрагамаздымка і інш., заснаваныя на вывучэнні эл.-магнітных і гравітацыйных палёў, гама-прамянёў і інш.; аэравізуальныя назіранні — агульны агляд мясцовасці з паветра для вывучэння прыродных асаблівасцей і культ. ландшафту. Паводле шырыні ўжывання і колькасці інфармацыі гал. метад — аэрафотаздымка. Аэрагеафіз. метадамі карыстаюцца пераважна для геал. вывучэння тэрыторыі і пошукаў карысных выкапняў. Пачынаюць ужывацца: спектраметрычная здымка — з даследаваннем спектральных яркасцей аб'ектаў; аэрарадарная здымка — з выкарыстаннем радыёхваляў і інш. віды А.

Літ.: Физические основы и технические средства аэрометодов, Л., 1967.

АЭРАНАВІГАЦЫЯ, гл. *Самалётаваджэнне.*

АЭРАПО́РТ (*аэра...*+лац. portus гавань), размешчаны на трасе паветранай лініі *аэрадром* з комплексам збудаванняў і абсталявання, прызначаных забяспечваць рэгулярныя палёты транспартных самалётаў. Мае аэравакзал, *ангар* і майстэрні для рамонту і тэхн. абслугоўвання самалётаў і інш. тэхнікі; радыёлакатары, аўтам. радыётэхн. сродкі, сістэмы святлосігнальных і навігацыйных прылад, метэаралагічнае абсталяванне. У залежнасці ад прапускной здольнасці і тэхн. аснашчэння падзяляюцца на класы. Паводле прызначэння бываюць міжнародныя (абслугоўваюць самалёты некалькіх краін), базавыя (канцавыя ці прамежкавыя на ўнутраных паветраных лініях), на якіх базіруюцца самалёты, і мясц. (на мясц. паветр. лініях).


АЭРАСТА́Т (*аэра...*+statós нерухомы), лягчэйшы за паветра лятальны апарат. Абалонку А. напаўняюць газам (вадародам, геліем, свяцільным газам і інш.), шчыльн. якога меншая, чым паветра. А. кіруюцца рухавікамі і паветранымі вінтамі (*дырыжаблі* і матарызаваныя А.) ці свабодна плаваюць у паветры. Каб падняць на большую вышыню свабодны (сферычны) А., які мае абалонку ў форме шара, з гандолы яго скідваюць баласт



Рыс. 1. Свабодны сферычны аэрастат: *1* — абалонка; *2* — паясная вяроўка; *3* — стропы; *4* — стропавае кольца; *5* — гандола; *6* — клапанная вяроўка; *7* — апендыкс; *8* — пояс; *9* — клапан выпуску газу.

(пясок), а каб апусціць, выпускаюць праз клапан у абалонцы газ. Такія А. (*стратастаты,* субстратастаты, шары-пілоты, балоны-зонды, радыёзонды) выкарыстоўваюць пры даследаванні атмасферы, у спорце, у трэніроўцы пілотаў-дырыжаблістаў.

Прывязаныя (змейкавыя) А., якія маюць падоўжаную форму і апярэнне на карме, мацуюць тросам да лябёдкі на зямлі. Яны падзяляюцца на А. назірання, загароды і метэаралагічныя. З А. назірання вядуць ваенную разведку і карэкціроўку артыл. агню. А. загароды прызначаны для абароны важных аб'ектаў ад



Рыс. 2. Схема размяшчэння абсталявання аўтаматычнага аэрастата: *1* — абалонка; *2* — апендыкс; *3* — адчапное прыстасаванне; *4* — парашут; *5* — радарны адлюстравальнік; *6* — гандола з апаратамі і балластніцай; *7* — антэна; *8* — радыёперадатчык; *9* — антэна; *10* — груз.

непрыяцельскіх самалётаў; падымаюцца ў паветра густой сеткай (радамі ці ў шахматным парадку) на выш. больш за 4500 *м*. У Айч. вайну іх шырока выкарыстоўвалі ў сістэме ППА Масквы, Ленінграда і ў інш. месцах. Метэаралагічнымі А. падымаюцца прылады, якія запісваюць на розных вышынях т-ру і вільготнасць паветра, скорасць і напрамак ветру, сонечную радыяцыю, авесткі для вывучэння касмічных прамянёў і інш. Такія А. перамяшчаюцца на адлегласць 20—30 тыс. *км*.

АЭРАТЭ́НК (*аэра...*+англ. tank бак), праточны басейн з бетону ці жалезабетону для ачысткі сцёкавых водаў. Памеры: выш. 3—5 *м*, шыр. 3—12 *м*, даўж. да 150 *м*. Ачышчаюць актыўным ілам (бактэрыі-мінералізатары і ніжэйшыя арганізмы) пры бесперапыннай падачы паветра (*аэрацыі*). Сумесь адстоенай сцёкавай вадкасці і актыўнага ілу працякае па А. і прадзімаецца паветрам, кісларод якога падтрымлівае жыццядзейнасць бактэрый і акісленне арган. забрудненняў. З наступных адстойнікаў асадак актыўнага ілу перапампоўваецца ў А., а лішак яго апрацоўваецца з асадкам першасных адстойнікаў. Сцёкавая вада ачышчаецца ў А. за 6—12 *гадз*. Ступень ачысткі ад 40 да 98%.

АЭРАТЭРАПІЯ (*аэра...*+therapeia лячэнне), лячэнне і загартоўванне арганізма атмасферным паветрам. Віды А.: паветраныя ванны — дзеянне паветра на голае цела; верандавае лячэнне — працяглае (амаль кругласутачнае) лежанне на паветры ў адзенні (адпаведна сезону). Як лячэбная працэдура А. з'яўляецца часткай санаторна-курортнага рэжыму, як загартоўчая і трэніравальная — у час заняткаў рознымі відамі спорту на свежым паветры. А. рэкамендуецца ва ўсіх выпадках, калі трэба ўмацаваць арганізм, павысіць яго жыццёвы тонус і ўстойлівасць да неспрыяльных дзеянняў вонкавага асяроддзя: пры туберкулёзе, неўрастэніі, ператамленні, анеміі, хваробах сардэчна-сасудзістай сістэмы і верхніх дыхальных шляхоў. А. назначаюць з асцярожнасцю асобам, якія хварэюць на рэўматызм, хранічныя запаленні суставаў, неўрыты. *І. П. Антонаў.* Мінск.

АЭРАФОТАЗДЫ́МКА, фатаграфаванне зямной паверхні з самалётаў, штучных спадарожнікаў Зямлі і інш. лятальных прылад для стварэння тапаграфічных планаў і карт; інжынернай разведкі пад будаўніцтва чыгунак, аўтамабільных дарог і інш. інжынерных збудаванняў; геалагічных, гідрагеалагічных, глебава-геабатанічных і метэаралагічных даследаванняў; леса- і землеўпарадкавання; вывучэння прыродных рэсурсаў; разведкі ваенных аб'ектаў праціўніка і інш. Складаецца з лётназдымачнага і фатаграфічнага працэсаў. Робіцца спец. аэрафотаапаратамі (АФА) пры верт. (планавая А.) або нахільным (перспектыўная А.) становішчы аптычнай восі.

Каб пашырыць палосу здымкі, робіцца планава-перспектыўная А. (з аднаго пункта некалькімі АФА, аптычныя восі якіх накіраваны веерам у верт. плоскасці і адна з восяў вертыкальная). У асобных выпадках ужываецца канвергентная А. (двума АФА, аптычныя восі якіх пераслаюцца ў плоскасці палёту). Для павелічэння вырашальнай здольнасці здымкаў і вугла зроку ўжываюць шчылінную А.— фатаграфаванне вузкай палосы з дапамогай шчылінных АФА на плёнку, якая бесперапынна перамяшчаецца. У залежнасці ад размяшчэння шчыліны А. таксама бывае планавая, панарамная і інш. Найбольш пашырана планавая А. Яна дае зручнае для далейшай апрацоўкі адлюстраванне мясцовасці ў цэнтральнай праекцыі. Фатаграфуюць адзіночнымі кадрамі і шэрагам паслядоўных кадраў, па асобных маршрутах або шэрагам паралельных маршрутаў на плошчы. Звычайна здымкі робяцца з падоўжным па маршруце (60%) і папярочным паміж суседнімі маршрутамі (30—40%) перакрыццём. Гэта даваляе атрымаць стэрэаскапічны эфект пры іх вывучэнні. У залежнасці ад фотаматэрыялаў, якія ўжываюцца, існуе некалькі відаў А. Пераважна карыстаюцца чорна-белай А., але карыстаюцца каляровай і спектразанальнай А. (з фатаграфаваннем у некалькіх зонах спектра і наступным атрыманнем адбітка са скажонымі ў патрэбным напрамку суадносінамі колераў). Фатаграфічны працэс — фоталабараторная апрацоўка матэрыялаў А., у выніку якой атрымліваюць аэрафільмы з негатыўным адлюстраваннем, пазітыўныя кантактавыя і праекцыйныя адбіткі з іх (аэрафотаздымкі), накідны мантаж і інш. Звычайныя памеры здымкаў (см) 18×18, 21×21 і 30×30. Далейшая апрацоўка аэрафотаздымкаў у залежнасці ад мэты даследаванняў складаецца з тапографа-геадэзічных фотаграмметрычных работ (гл. *Аэрафотатапаграфічная здымка*) або спецыяльнага дэшыфравання для стварэння патрэбных планаў і карт.

Літ.: Аэросъемка и ее применение. Труды IX Всесоюзного совещания по аэросъемке, Л., 1967; Дробышев Ф. В. Основы аэрофотосъемки и фотограмметрии, М., 1963; Богомолов Л. А. Топографическое дешифрирование природного ландшафта на аэроснимках, М., 1963; гл. таксама літ. пры артыкулах *Аэрагеаздымка, Аэрametады.*

АЭРАФОТАТАПАГРАФІ́ЧНАЯ ЗДЫ́МКА, стварэнне тапаграфічных планаў і карт з дапамогай аэрафотаздымкі. Бывае контурная, камбінаваная і стэрэафотаграмметрычная. Комплекс работ пры складанні па аэрафотаздымках толькі контурнай часткі называецца контурнай А. з. Пры камбінаванай А. з. контурная частка ствараецца па матэрыялах *аэрафотаздымкі*, а рэльеф па выніках наземных тапаграфічных работ з дапамогай мензулы або тахеометра. Пры стэрэафотаграмметрычнай А. з. контурная і вышынная часткі планаў і карт складаюцца ў выніку вымярэнняў на аэрафотаздымках.

Комплекс аэрафотатапаграфічных работ складаецца з лётназдымачнага, фатаграфічнага, тапографа-геадэзічнага і фотаграмметрычнага працэсаў. Задача лётназдымачнага працэсу — фатаграфаванне мясцовасці з паветра і запіс паказанняў прылад, якія характарызуюць становішча аэрафотаапарата ў момант здымкі. Фатаграфічны працэс прадугледжвае фоталабараторную апрацоўку матэрыялаў здымкі. Тапографа-геадэзічны працэс: вызначэнне каардынатаў і вышынь асобных пунктаў мясцовасці, адлюстраваных на аэрафотаздымках (наземная прывязка здымкаў); дэшыфраванне аэрафотаздымкаў; а таксама наземная здымка рэльефу мясцовасці пры камбінаванай А. з. У працэсе фотаграмметрычных работ на спецыяльных прыладах (стэрэакампаратары, стэрэометры, мультыплексы, стэрэографы, стэрэапраектары і інш.) апрацоўваюць здымкі і ў выніку атрымліваюць тапаграфічны план або карту мясцовасці.

Літ.: Коншин М. Д. Аэрофотограмметрия, М., 1967; Дейнеко В. Ф. Аэрофотогеодезия, М., 1968.

АЭРА́ЦЫЯ (франц. aération ад *аэра...*), 1) апрацоўка паветрам вады для піцця і тэхн. патрэб (уключаючы сцёкавыя воды). Ажыццяўляецца распырскваннем вады ў паветры або прадзіманнем яе паветрам. Ужываецца для выдалення з вады растваных у ёй газаў або інш. прымесей, а таксама для насычэння кіслародам (напр., сцёкавых водаў) ці аэробнымі бактэрыямі. 2) А. будынкаў, адбываецца ў выніку рознай удз. масы вонкавага і ўнутр. паветра і дзеяння ветру. Вонкавае паветра пранікае праз вокны і інш. адтуліны ў сценах, а выдаляецца праз ліхтары будынкаў. Створкі ліхтара рэгулююцца спец. мех. прыстасаваннямі. 3) А. глебы — газаабмен глебавага паветра з атмасферным; адбываецца натуральна, неабходная для росту і развіцця раслін. Гл. *Паветраны рэжым глебы.*

АЭРАЭЛЕКТРАРАЗВЕ́ДКА, геафізічныя метады даследавання геалагічнай будовы раёна і пошукаў карысных выкапняў. Засн. на аўтам. вымярэнні з самалёта ці з верталёта магнітнай кампаненты другасных эл.-магн. палёў, што ўтвараюцца горнымі пародамі з рознымі эл. ўласцівасцямі (удз. эл. супраціўленнем і дыэлектрычнай пастаяннай).

У якасці першаснага поля выкарыстоўваюцца штучна створаныя эл.-магн. палі заземленага дыполя (метад ВДК), генератарнай рамкі (метад індукцыі), шырокавяшчальных радыёстанцый (радыёкампарацыйны метад) або натуральныя пераменныя палі навальнічных разрадаў (метад AFMAG) і інш. Вядома да дзесятка розных схем

А. У СССР выкарыстоўваюцца: метад бясконца доўгага кабелю ВДК, калі першаснае поле ўтвараецца пераменным токам, што працякае па размешчаным на паверхні зямлі кабелі, канцы якога заземлены; а таксама метад індукцыі, калі першаснае поле ўтвараецца генератарнай рамкай, што размешчана на самалёце. Ужываецца для выяўлення і высочвання буйных сульфідных целаў, для геал. карціравання вялікіх плошчаў, выяўлення падземных прэсных водаў сярод засоленых. У параўнанні з наземнай электраразведкай характарызуецца высокай прадукцыйнасцю.

АЭРО́БЫ (*аэра...+бія...*), арганізмы, для жыццядзейнасці якіх неабходны свабодны малекулярны кісларод. Да А. адносяцца ўсе вышэйшыя арганізмы (жывёлы і расліны) і вялікая група мікраарганізмаў. Паводле адносін да кіслароду падзяляюцца на аблігатныя (безумоўныя) або аэрафілы, якія не развіваюцца без доступу паветра і выкарыстоўваюць толькі энергію акіслення, і факультатыўныя (умоўныя), якія могуць развівацца ў асяроддзі з паніжанай колькасцю кіслароду, выкарыстоўваючы для сваёй жыццядзейнасці энергію *браджэння*. Параўн. *Анаэробы*.

АЭРОГРАФ (*аэра...+gráphō* пішу), пнеўматычнал прылада для распылення фарбы. З дапамогай А. наносяць фарбу на паперу, метал і інш. матэрыялы. Шырока ўжываецца ў рэтушаванні фотанегатываў, фотаадбіткаў, ілюстрацый, пры размалёўцы тканін, тэатр. дэкарацый, буйнафарматных насценных плакатаў. А., якім фарбуюць фасады будынкаў, сцены і г. д., называецца *фарбапультам*.

АЭРО́Н (сумесь скапаламіну і гіяцыяміну — алкалоідаў тыпу *атраціну*), лякарства, якое зніжае ўзбуджальнасць ірвотнага цэнтра, змяншае сакрэцыю слінных і слізістых залоз. Таблеткі А. ўжываюць, каб папярэдзіць марскую і паветраную хваробы (за 30—60 *мін* да ад'езду) ці пры першых прыкметах іх — моташнасці, галавакружэнні; супраць хваробы Меньера, моташнасці і рвоты цяжарных і інш. Проціпаказаны пры глаўкоме.

АЭРЭНХІМА (*аэра...+enchyma* напаўнене, тут тканіна), раслінная тканка з вялікай колькасцю міжклетнікаў, запоўненых паветрам.

А. характэрная водным і балотным раслінам (гарлачыкам, чароту і інш.), карані і карэнішчы якіх знаходзяцца ў глеі, бедным на кісларод. Есць у розных органах раслін — сцяблах, каранях, карэнішчах, у лісці. Складаецца з тонкасценных клетак, якія ствараюць перамычкі паміж паветранымі поласцямі. А. памяншае ўдз. масу раслін, памагае ім трымацца на вадзе ў вертыкальным стане, назапашвае кісларод і вуглякіслы газ.

АЮЦАВІЧЫ, вёска ў Сімакаўскім с/с Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл., на р. Міранцы. Цэнтр калгаса «За мір». За 30 *км* на ПдУ ад Карэліч, 234 *км* ад Гродна, 13 *км* ад чыг. ст. Гарадзея. 891 ж., двароў 299 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельч.-ак. пункт, магазін.

А́ЯВА (Iowa), штат у ЗША. Пл. 145,8 тыс. км², 2,8 млн. ж. (1967). Адм. ц.— г. Дэ-Мойн. Паверхня — узгорыстая раўніна. Клімат умерана кантынентальны. Займае асн. месца ў с.-г. вытворчасці ЗША. Кармавыя культуры: кукуруза (1-е месца ў краіне), авёс, травы, соевы боб. Адкорм свіней, буйн. раг. жывёлы. Птушкагадоўля. Перапрацоўка с.-г. сыравіны, вытворчасць с.-г. машын. Электратэхнічная, металаапр., хім. і дрэваапрацоўчая прамысловасць. У гарадах Давенпарт, Дуб'юк ваенная прамысл. Суднаходства па рэках Місісіпі і Місуры. Раўнамерна развіта сетка чыгунак і аўтамабільных дарог.

АЯМА Ікуо (20.9.1880—30.11.1955), грамадскі дзеяч Японіі. У 1905 скончыў палітыка-эканам. ф-т ун-та Васэда (Токіо). З 1915 праф. гэтага ун-та. Прытаставаў супраць інтэрвенцыі яп. імперыялізму на Савецкім Д. Усходзе. У 1932 эмігрыраваў у ЗША. Вярнуўся ў 1947. Выступаў за аб'яднанне дэмакр. сіл Японіі, за добрасуседскія адносіны з СССР і КНР. З яго ўдзелам у Японіі быў скліканы 1-ы Нац. кангрэс абароны міру (крас. 1949). З 1950 старшыня Японскага камітэта абароны міру, з 1951 чл. Бюро Сусв. Савета Міру. Адзін з арганізатараў 1-й Міжнар. канфер. за забарону атамнай і вадароднай зброі (жн. 1955). Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1951.



Літ.: Биография Икуо Ояма, сокр. пер. с яп., М., 1958.

Б

Б, другая літара беларускага і некаторых іншых славянскіх алфавітаў. Абазначае звонкі прарыўны губна-губны гук «б». Паходзіць з кірыліцкай Б («букі»), утворанай графічным відазмяненнем візант. літары В. Роднае напісанне лац. В і слав. Б тлумачыцца тым, што рымляне запазычылі ў грэкаў алфавіт каля 6 ст. да н. э., калі β абазначала гук «б». Пад час запазычання алфавіта славянамі (9 ст.) у грэч. мове β вымаўлялася як «в», а такім значэннем гэтая літара замацавалася ў слав. графіцы.

БАБА́ЕВІЧЫ, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл., на р. Лань. Цэнтр сельсавета. За 4 *км* на Пд ад Клецка, 144 *км* ад Мінска, 6 *км* ад чыг. ст. Клецк. 1060 ж., двароў 335 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін.

БАБА́ЕЎ Тухтасін (н. 12.1.1923, с. Джан-Кетмень Ферганскай вобл. Туркестанскай АССР), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942. Вызначыўся 3.10.1943 пры разведцы зах. берага Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У баі за плацдарм аддзяленне Б. адбіла 4 контратакі ворага. Жыве ў г. Ахангаран Ташкенцкай вобл.

БАБА́НАВА Марыя Іванаўна [н. 29.10(11.11). 1900, Масква], руская савецкая актрыса. Нар. арт. СССР (1954). З 1920 у т-ры РСФСР 1-м, з 1927 у т-ры Рэвалюцыі (т-р імя Маякоўскага). Майстар тонкага псіхалаг. малюнка ролі, філіграннай тэхнікі. З роляў: Паліна («Даходнае месца» А. Астроўскага), Гога («Чалавек з партфелем» А. Файко), Джульета («Рамэо і Джульета» У. Шэкспіра), Таня («Таня» А. Арбузава). Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. 2 ордэнамі.

БАБАРЭ́КА Адам Антонавіч [2(14).10.1899, в. Слабада-Кучынка Слуцкага пав. Мінскай губ.— 10.10.1938], беларускі савецкі пісьменнік і крытык. З сям'і беззямельнага селяніна. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1913—18). У 1918—21 пастаўпічаў з перапынкамі, бо ў час польскай акупацыі быў у падполлі, удзельнічаў у партызанскім руху па Случчыне, быў зняволены белапалякамі (1920). Служыў палітработнікам у Чырв. арміі (1921—22). У 1927 скончыў БДУ. Выкладчык бел. мовы і л-ры ў Камуніст. ун-це Беларусі імя Леніна (1926—29), асістэнт кафедры гісторыі бел. л-ры БДУ (з 1928). Друкаваўся з 1919. Акрамя вершаў, якія падпісваў псеўд. Адам Чырвоны, Якім Каліна, выступаў з апавяданнямі пра класавую барацьбу ў вёсцы, ролю сялянскай моладзі ва ўмацаванні Сав. улады. З 1923 уваходзіў у літ. аб'яднанне «Маладняк», з 1926 — ва «Узвышша». У артыкулах 1926—30 распрацоўваў пытанні літаратуразнаўства і эстэтыкі.



Тв.: Апавяданні, Мн., 1925; Жыццёпіс і працы, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Конан У. М. Адам Бабарэка, «Полымя», 1965, № 1; яго ж. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917—1934 гг.), Мн., 1968.

БАБАЎНЯНСКІ ВЫСТУП, найбольш узнятая частка *Беларускага крышталічнага масіву*. Назва паходзіць ад в. Бабоўня, дзе ўпершыню крышталічны фундамент выяўлены на адносна невялікай глыбіні. Акантурваецца ў межах на Пд ад Дзятлава, Нясвіжа, Капыля да Слуцка, на У ад Старых Дарог, на Пн ад Уазы, Стоўбцаў, на У ад Ліды, на З ад Шчучына і далей на Пд ад Дзятлава. Паверхня крышталічнага фундамента залягае на адзнаках ад +87 *м* ад узроўню мора на У да −60 *м* на З. На У яна перакрываецца кайназойскімі адкладамі, а на З верхнемелавымі. Зах. частку Б. в. некаторыя аўтары вылучаюць пад назвай Морына-Беліцкага выступу.

БАБА́ХІН Каліграт Іванавіч (н. 2.5.1918, в. Казлоўка Томскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. У Айч. вайну камандзір аддзялення ў сапёрным батальёне.

Вызначыўся ў баях пры фарсіраванні Бярэзіны (каля Барысава) і Нёмана (каля Друскінінкая). 30.6.1944 пад агнём ворага першы пераплыў Бярэзіну. Пераправіў на плыце 4 гарматы, 42 павозкі з боепрыпасамі і больш за 120 байцоў. 14.7.1944 каля в. Уцеха на ПнЗ ад Друскінінкая працягнуў цераз Нёман і замацаваў на зах. беразе трос, што памагло хутчэй фарсіраванню ракі. Жыве на радзіме.

БАБАЧКІН Барыс Андрэевіч [н. 5(18).1.1904, Саратаў], рускі савецкі акцёр тэатра і кіно. Нар. арт. СССР (1963). Чл. КПСС з 1948. Сцэнічную дзейнасць пачаў у 1921. З роляў: Улас («Дачнікі» М. Горкага), Клавераў («Цоні» М. Салтыкова-Шчадрына), Іванаў («Іванаў» А. Чэхава). З 1927 здымаецца ў кіно. Стварыў суєв. вядомы вобраз Чапаева («Чапаеў», 1934). У 30-я г. здымаўся ў фільмах бел. студыі: «Вяртанне Нейтана Бекера», «Першы ўзвод», «Двойчы народжаны». Дзярж. прэміі СССР 1941, 1951. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: В театре и кино, М., 1968.

БАБАШБІНСКІ Аляксандр Іосіфавіч [н. 5(18).2.1905, Віцебск], беларускі сав. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1945), праф. (1946). Чл. КПСС з 1942. Скончыў Данскі вет. ін-т у 1932. Дырэктар, старшы навук. супрацоўнік Ленінградскага н.-д. вет. ін-та (1938—48), заг. кафедры зоагігіены Ленінградскага вет. ін-та (1951—62), кафедры зоагігіены Віцебскага вет. ін-та (з 1962). Распрацаваў прафілактыку атручэння с.-г. жывёл ядавітымі раслінамі, даследаваў патагенез пры паратуберкулёзным энтэрыце буйной рагатай жывёлы.

Тв.: Отравление лошадей кирказоном, «Советская ветеринария», 1937, № 9; (разам з Л. І. Пятроўскай) Электрокалорифер для маточников, «Свиноводство», 1967, № 1.

БАБА-ЯГА (Баба-юга), міфічны персанаж у фальклоры славянскіх народаў. У бел. нар. казках бывае ў 2 вобразах: добрая старая, што памагае, дае парады казачным героям; ліхая людаедка Баба-яга — касцяная нага. Жыве ў цёмным лесе, у хатцы на курынай ножцы, ноччу лётае ў ступе, замятае сляды памялом і робіць людзям шкоду. Вобраз Б.-я. вядомы з глыбокай старажытнасці і, мабыць, мае элементы матрыярхату; захаваўся ў казках для дзяцей.

БАБЕЗІЁЛЕЗЫ (бабевіёзы), інвазійныя хваробы буйной рагатай жывёлы, авечак і коз, выкліканыя паразітамі эрытрацытаў — аднаклетачнымі прасцейшымі роду Babesia.

Узбуджальнікаў хваробы ў свойскіх жывёл упершыню апісаў рум. паразітолаг В. Бабеш (1888). Б. буйной рагатай жывёлы ў Расіі ўпершыню выявілі С. М. Паўлушкаў, С. І. Драчынскі, С. К. Бейнаровіч, на Беларусі яго даследавалі В. Ф. Гусеў і інш. Хвароба пашырана ў паўн.-зах. і цэнтр. зонах СССР і краінах Еўропы, а Б. авечак і коз — у краінах Еўропы, у Кітаі, Індыі (у СССР сустракаецца ў Крыме, Закаўказзі, Туркменіі, Таджыкістане, на Паўн. Каўказе). Б. буйной рагатай жывёлы (паўночны піраплазмоз) выклікаецца B. bovis, авечак і коз — B. ovis. Крыніца інвазіі — кроў хворых і часткова перахваралых жывёл, у эрытрацытах якіх знаходзяцца паразіты. Пераносчыкі Б. буйной рагатай жывёлы — кляшчы роду Ixodes: I. ricinus і I. persulcatus, а коз і авечак — клешч Rhipicephalus bursa.

Пры развіцці хваробы разбураюцца эрытрацыты і пачынаецца *анемія*; парушаецца работа сэрца, лёгкіх, нырак, селязёнкі і інш. органаў. Гемаглабін разбураных эрытрацытаў трапляе ў мачу, афарбоўвае яе ў чырвоны колер, адсюль нар. назва Б.— крывямочка. Інкубацыйны перыяд Б. 8—14, клінічны 4—8 дзён. У хворай жывёлы прыгнечаны стан, жаўтушныя слізістыя абалонкі, павышаная т-ра цела (41—42 °С), частата дыхання да 86, пульс да 140 удараў у мінуту, слабага напаўнення. Малако жаўтаватае, потым чырванаватае і горкае. Надой рэзка зніжаецца, малако часта зусім прападае. Цяляты да аднаго года хварэюць лёгка, без клінічных прыкмет і набываюць імунітэт; дарослыя жывёлы часткова гінуць. Дыягназ ставіцца на аснове эпізааталагічных фактараў, клінічных назіранняў і мікраскапічных даследаванняў мазкоў крыві (з вуха). Лячэнне ад Б. накіравана на знішчэнне паразітаў хім. прэпаратамі, а таксама на падтрыманне работы сардэчна-сасудзістай і стрававальнай сістэм. Прафілактыка: знішчэнне паразітаў хім. прэпаратамі ў інкубацыйны перыяд; знішчэнне кляшчоў акарыцыдамі на жывёлах, а на пашы — меліярац. работамі.

Літ.: Чиж А. Н. Бабезиеллоз крупного рогатого скота, М.—Л., 1955. *М. І. Дылько.* Мінск.

БАБЕК, Папак (сапр. Гасан; каля 800—838), правадыр народнага паўстання ў Азербайджане і Зах. Іране супраць арабскіх захопнікаў. З 816 узначальваў т. зв. рух хурамітаў, які ў 30-я г. 9 ст. набыў характар нар. вайны за вызваленне з-пад прыгнёту Багдадскага халіфата. Былі вызвалены амаль увесь Азербайджан і Зах. Іран. З дапамогай здраднікаў-феадалаў арабы ў 837 задушылі паўстанне; Б. пакараны смерцю. Паўстанне аслабіла халіфат і паскорыла яго распад.

БАБЁР, рачны бабёр (Castor fiber), млекакормячая жывёла атрада грызуноў. Даўж. каля 100 *см*, маса каля 20 *кг*. Ногі кароткія, пяціпальцыя, заднія з плавальнымі перапонкамі. Поўсць густая, шаўкавістая, з доўгімі жорсткімі асцявымі валасамі і густым пухам. Колер ад светлага да цёмна-бурага і чорнага. Хвост пляскаты (шыр. да 15 *см*), укрыты рагавымі шчыткамі. У мінулым Б. быў вельмі пашыраны ў лясной зоне Еўропы і Паўн. Азіі (у Паўн. Амерыцы жыве другі від — канадскі Б.). З-за каштоўнага футра і асабліва змесціва мускусных залоз (гл. *Бабровы струмень*) Б. былі амаль вынішчаны. У СССР на 1930 іх было 800—900. Каб захаваць і павялічыць колькасць Б., створаны спец. запаведнікі і заказнікі (на Беларусі Бярэзінскі запаведнік і некалькі заказнікаў). Б. спецыяльна рассяляюць ў многіх абласцях краіны. Водзяцца ў Францыі, ГДР, Польшчы, Нарвегіі, Фінляндыі, Манголіі і Паўн.-Усх. Кітаі. Жывуць сем'ямі. Спосаб жыцця паўводны. Насяляюць рэкі і азёры, берагі якіх параслі лесам і хмызнякамі. Раюць норы, будуюць хаткі з падводным уваходам, запруды, каб падняць узровень вады. Робяць канавы для сплаву корму і будаўнічага матэрыялу. Кормяцца карэнішчамі травяністых раслін, карой і маладымі галінкамі лазы, асіны і інш. Падгрызаюць дрэвы да 1 *м* у дыяметры. Увосень назапашваюць кармы (да 20 *м*³). Спарваюцца ў студз.— лютым (цяжарнасць каля 105 дзён). Нараджаюць 1—5 бабранят. Жывуць да 20 гадоў. Асн. запасы Б. у СССР на Беларусі (25—30 тыс.). З 1963 пачаўся арганізаваны адлоў Б. Футра іх цэніцца за прыгажосць і трываласць. Гл. іл. на ўкл. да арт. *Бярэзінскі дзяржаўны запаведнік, Грызуны.*

Літ.: Федюшин А. В. Речной бобр, его история, жизнь и опыты по размножению, М., 1935; Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961. *Ю. І. Сяржанін.* Мінск.

БАБЁФ (Babeuf) Гракх (сапр. Франсуа Нэль; 23.11.1760, Сен-Кантэн — 27.5.1797), французскі рэвалюцыянер, кіраўнік руху «ў імя роўнасці», камуніст-утапіст. Напярэдадні франц. бурж. рэвалюцыі канца 18 ст. выступаў супраць феад. ілмельнай уласнасці, выстаўляў ідэю стварэння калектыўных фермаў. У час рэвалюцыі ўдзельнічаў у сялянскім руху, быў прыхільнікам рэспублікі. У заснаванай ім газ. «Journal de la liberté de la presse» («Газета свабоднай прэсы»; пазней перайменавана ў «Le Tribun du peuple» «Трыбун народа») рэзка крытыкаваў палітыку контррэвалюц. тэрмідарыянскага Канвента, за што 17.2.1795 быў зняволены. Пасля вызвалення 18.10.1795 узнавіў выданне газеты. У 1796 стварыў «тайную паўстанцкую дырэкторыю», якая рыхтавала ўзбр. выступленне. Змова была раскрыта, а Б. гільяцінаваны. Б. і яго прыхільнікі (бабувісты) паставілі пытанне аб практычным ажыццяўленні камуніст. перабудовы грамадства. Але яны не раскрылі ролі пралетарыяту як гегемона сацыялістычнай рэвалюцыі, не пайшлі далей загаворшчыцкай тактыкі. К. Маркс і Ф. Энгельс высока ацэньвалі дзейнасць Б. і адносілі яго творы да той літаратуры, «якая ва ўсіх вялікіх рэвалюцыях новага часу выражала патрабаванні пралетарыяту» (Соч., т. 4, с. 455).



Літ.: Далин В. М. Гракх Бабеф..., М., 1963 (бібліягр.); Волгин В. П. Французский утопический коммунизм, М., 1960, с. 57—86; Буонарроти Ф. Заговор во имя равенства, т. 1—2, [2 изд.], пер. с франц., М., 1963.



БАБІЙ Зіновій Іосіфавіч (н. 27.1.1935, в. Падсадкі на Львоўшчыне), беларускі савецкі спявак (лірыка-драматычны тэнар). Нар. арт. БССР (1964). Вучыўся ў Кіеўскай кансерваторыі.





З. І. Бабій у ролях Манрыка (злева) і Атэла.

Творчую дзейнасць пачаў у Ансамблі песні і танца Прыкарпацкай ваеннай акругі. Саліст т-раў оперы і балета імя Шаўчэнкі (Кіеў, 1957—60) і імя Франка (Львоў, 1960—62). З 1963 у Бел. т-ры оперы і балета. Акцёрскай індывідуальнасці Б. найбольш адпавядаюць партыі драм. плана. З асаблівым поспехам выступіў у ролі Атэла ў аднайменнай оперы Дж. Вердзі. З інш. роляў: Манрыка, Радамес, Герцаг («Трубадур», «Аіда» і «Рыгалета» Дж. Вердзі), Каніо («Паяцы» Р. Леанкавала), Каварадосі, Рудольф, Пінкертон («Тоска», «Багема» і «Чыо-Чыо-сан» Дж. Пучыні), Хазэ («Кармэн» Ж. Бізэ), Герман («Пікавая дама» П. Чайкоўскага), Сяргей («Алеся» Я. Цікоцкага). Вядзе шырокую канцэртную дзейнасць. *Г. М. Загародні.* Мінск.

БАБІНА (франц. bobine), 1) у тэкстыльнай прамысловасці — капічная шпуля без фланцаў, на якую крыжападобна намотаны пража, роўніца ці інш. паўфабрыкаты. 2) У аўтамабілях — шпуля запальвання ў карбюратарных рухавіках унутр. згарання, якая ператварае з дапамогай мех. перарывальніка пастаянны ток нізкага напружання (6—12 *в*) у імпульсны ток высокага напружання (5—15 тыс. *в*). 3) У горнай справе — барабан для намотвання каната ў падымальных машынах (звычайна праходчых).

БАБІНА КАША, старадаўняя абрадавая страва на хрэсьбінах у беларусаў. Яе варыла бабка-павітуха з прасяных ці інш. круп на малацэ, дадаючы яйкі, масла, цукар. Зверху кашу аздаблялі цукеркамі і кветкамі. Падавалі пад канец святочнага абеду. Пасля т. зв. «торгу» гаршчок з Б. к. аддавалі госцю, які падносіў бабцы пайлепшы падарунак. Той, каму даставалася Б. к., гаршчок разбіваў на шчасце народжанаму і на чарапку гаршка частаваў кожнага госця кавалачкам кашы. У апошнія гады пры святкаванні радзін дзіцяці як Б. к. даюць цукеркі, пячэнне ці торт, якія па традыцыі падаюць у гаршку ці на гаршку.

І. П. Корзун. Мінск.

БАБІНА ЛЕТА, сухія, ясныя, цёплыя дні ў канцы верасня — пач. кастрычніка. Метэаралагічныя абставіны Б. л.— *адвекцыя* цёплых паветраных мас з паўд. шырот пры па-

вышаным атмасферным ціску, які абумоўлівае малую воблачнасць і адсутнасць ападкаў. У паветры лётае павуцінне, дзянётнік. У перыяд працяглага Б. л., якое надыходзіць пасля значнага пахаладання, паўторна зацвітаюць некат. пладовыя дрэвы. У мінулым гэта быў час жаночых работ у полі: уборкі канапель і апрацоўкі лёну. З назвай Б. л. звязана шмат нар. песень.

БАБІНАВІЧЫ, вёска ў Лёзненскім р-не Віцебскай вобл., на зах. беразе Зелянскога (Бабінавіцкага) возера. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Заслонава. За 29 *км* на ПдЗ ад Лёзна, 75 *км* ад Віцебска, на шашы Лёзна — Арэхаўск. 753 ж., двароў 234 (1970). Цагельня, лясніцтва, пякарня, філіял Лёзненскага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад і яслі, бальніца, аддз. сувязі, сталовая, 4 магазіны. У Айч. вайну вёску спалілі фашысты. Помнік «Воіну-пераможцу». У Б. выяўлены археал. комплекс з трох неалітычных паселішчаў (3—2,5 тысячагоддзі да н. э.). Адкрыты і даследаваўся ў 1967—68 І. М. Ціханенкавым. Пры раскопках знойдзены крамяпёвыя прылады працы, фрагменты керамікі, арнаментаванай ямкамі, насечкамі, грабеньчатым узорам. Культура паселішчаў Б. блізкая да *валдайскай культуры*, заўважаецца значны ўплыў верхнедняпроўскай неалітычнай культуры.

БАБІНІЧЫ, вёска ў Панізоўскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Бабінічы». За 10 *км* на Пд ад Оршы, 90 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. прыпынку Руміна, на шашы Орша — Магілёў. 538 ж., двароў 199 (1970). Птушкафабрыка, адда. «Сельгастэхніка», швейная і шавецкая майстэрні. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, мед. пункт, адда. сувязі, магазін.

БАБІНІЧЫ, вёска ў Віцебскім р-не, каля р. Віцьба (1,5 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Беларусь». За 10 *км* на ПнУ ад Віцебска, 16 *км* ад чыг. ст. Віцебск, на шашы Віцебск — Сураж. 450 ж., двароў 160 (1970). Сярэдняя школа, Палац культуры, бальніца, аптэка, вет. ўчастак, адда. сувязі, магазін, школьны краязнаўчы музей. На брацкай магіле ў вёсцы помнік сав. воінам і партызанам, каля школы помнік-абеліск 135 настаўнікам і вучням, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБІНСКІ (Bobiński) Станіслаў Фелікс (Станіслаў Янавіч; парт. псеўд. Рафал; літ. псеўд. Р. Няруда, Ян Крачынскі, Ляліва; 20.11.1882, Варшава — 1937), дзеяч польскага рэвалюцыйнага руху, публіцыст. У рэвалюц. рух уключыўся ў 1899. У 1905 уступіў у СДКПіЛ. Арыштоўваўся царскімі ўладамі. З 1913 чл. Варшаўскага к-та СДКПіЛ. З 1917 чл. ЦВК груп СДКПіЛ у Расіі. Пасля Лют. рэвалюцыі чл. Маскоўскага акруговага бюро і гарадскога к-та РСДРП(б), чл. выканкома Маскоўскага Савета. Па Мінскай выбарчай акрузе балаціраваўся ва Устаноўчы сход па спісе бальшавікоў. У Кастр. рэвалюцыю чл. ваен. бюро пры Маскоўскім к-це РСДРП(б), кіраўнік рэзервовага штаба



ВРК Маскоўскага Савета. У грамадз. вайну камісар Зах. дывізіі, чл. Рэўваенсавета Зах. фронту. Чл. савецкай дэлегацыі на канферэнцыі па падпісанні Брэсцкага міру. З пач. 1918 чл. ЦВК груп СДКПіЛ, з пач. 1919 груп КПРП у Расіі. З лют. 1919 узначальваў палітаддзел Наркамата земляробства Літоўска-Беларускай рэспублікі, на які ўскладаўся кантроль за ажыццяўленнем ленінскага Дэкрэта аб зямлі. Уваходзіў у камісію па аднаўленні работы Віленскага ун-та і адкрыцці ун-та ў Мінску. У час акупацыі Літвы і Беларусі польскімі войскамі працаваў у рэдакцыі газ. «Trybuna Robotnicza» («Рабочая трыбуна») у Смаленску, арганізатар і выкладчык курсаў па падрыхтоўцы польскіх парт. работнікаў у Мінску (1920). У 1919—22, 1926 чл. Польбюро ЦК РКП(б), загадчык яго выдавецкай камісіі, а потым замежнага аддзела; намеснік прадстаўніка КПП у Выканкоме Камінтэрна. Адзін з арганізатараў Уральскага камуніст. ун-та ў Свярдлоўску, яго рэктар і заг. кафедры філасофіі (1922—24). З 1925 працаваў у польскай камісіі гісторыі партыі пры ЦК ВКП(б), узначальваў парт. школу КПП. Быў дырэктарам Політэхнічнага музея ў Маскве (1929—31), з 1932 заг. рэдакцыі метадычнага савета аб'яднаных навукова-тэхнічных выдавецтваў. Аўтар публіцыстычных і навуковых артыкулаў.

Літ.: Хащкевич А. Ф. Польские интернационалисты в борьбе за власть Советов в Белоруссии, Мн., 1967; Najdus W. Polacy we władzach Republiki Litewsko-Białoruskiej, «Kwartalnik Historyczny», 1967, zesz. 3. *А. І. Марозава.* Мінск.

БАБІРОВА, вёска ў Завалочыцкім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 25 *км* на ПнЗ ад Глуска, 167 *км* ад Магілёва, 25 *км* ад чыг. ст. Старыя Дарогі. 773 ж., двароў 224 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБІТ, антыфрыкцыйны сплаў, пераважна на алавянай або свінцовай аснове. Ідзе на выраб укладышаў падшыпнікаў слізгання для рухавікоў, турбін, станкоў.

Састаў Б. на алавянай аснове (марка Б83): 83% волава, 11 сурмы і 6% медзі; на свінцовай (марка ВН): 65—75% свінцу, 9—11 волава, 13—14 сурмы, да 2 кадмію, 1 нікелю, 1% мыш'яку. Свінцова-кальцыевы Б. (напр., марка БКА), акрамя свінцу, змяшчае 1,0% кальцыю, 0,8 патрыю, да 0,8% алюмінію. Б. вызначаецца высокай пластычнасцю, невялікай т-рай плаўлення (240—440 °С) і нізкім каэф. трання, абумоўленым структурай металу.

БАБІЧАЎ Віктар Аляксеевіч [н. 3(16).4.1916, с. Петрапаўлаўка Цараўскага пав. Астраханскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. Удзельнічаў у вызваленні Віцебшчыны. Вызначыўся ў ліп. 1944

пры вызваленні в. Тычкі каля Вілейкі. Калі батарэя, у складзе якой служыў Б., апынулася ў акружэнні, ён падняў разлік гарматы ў атаку. У выніку рукапашнага бою падраздзяленне вырвалася з акружэння. Жыве ў г. Ахтубінску Астраханскай вобл.

БАБІЧЫ, вёска ва Узрэцкім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Дабрылаўка (прыток Бярозаўкі). Цэнтр калгаса «17 верасня». За 20 *км* на Пн ад Глыбокага, 205 *км* ад Віцебска. 152 ж., двароў 46 (1970). Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, магазін. Помнік 68 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБІЧЫ, вёска ў Тучанскім с/с Клецкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны партызан». За 17 *км* на Пд ад Клецка, 157 *км* ад Мінска, 19 *км* ад чыг. ст. Клецк. 445 ж., двароў 129 (1970). Пач. школа, клуб, бібліятэка, магазін.

БАБІЧЫ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Звязда». За 28 *км* на ПдЗ ад Рэчыцы, 78 *км* ад Гомеля, 1 *км* ад чыг. ст. Бабічы. 2269 ж., двароў 711 (1970). Лясніцтва Васілевіцкага лясгаса, камбінат быт. абслугоўвання. 2 школы, з іх 1 сярэдняя. 2 клубы, б-ка, бальніца, аптэка, дзіцячы сад і яслі, адда. сувязі, сталовая, 10 магазінаў. Курган Славы, мемарыяльны парк і помнік аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік на брацкай магіле 53 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБКА (каша-бабка, таркаванка), каша з дранай бульбы, адна з найбольш пашыраных традыцыйных страў у беларусаў. У драную бульбу, перш чым ставіць тушыць, кладуць падсмажанае сала, мяса, а таксама цыбулю, перац, лаўровы ліст і соль. Часта ў Б. дадаюць крупы, сушаныя яблыкі, вішні, грушы, слівы, ягады або фруктовую сумесь. Гатуючы, Б. некалькі разоў перамешваюць, каб не абіраўся ўсярэдзіне крухмал і каб яна не падгарэла. Перад тым як падаць на стол, Б. зноў прыпраўляюць салам або маслам. Ядуць звычайна з малаком.

І. П. Корзун. Мінск.

БАБКІ, гл. *Беларускія народныя гульні.*

БАБКОЎ Рыгор Еўдакімавіч [н. 15(28).9.1907, в. Гладкі Мыс Ачынскай акругі Енісейскай губ.], удзельнік баёў па Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Ваяваў па Цэнтр. і Бел. франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля г. п. Лоеў Гомельскай вобл. 15.10.1943 узвод, якім камандаваў старшына Б., пад агнём ворага пераправіўся на зах. бераг і выбіў фашыстаў з 1-й і 2-й траншэй; адбіў 3 контратакі і замацаваў плацдарм. Жыве ў Краснаярску.

БАБКОЎ Уладзімір Яўхімавіч (каля 1875, Стары Быхаў Магілёўскай губ.— 13.11.1905), актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху. Скончыў Магілёўскую гімназію, вучыўся ў Маскоўскім ун-це. У 1896 за ўдзел у дэманстрацыі пратэсту з прычыны катастрофы на Хадынскім полі выключаны з ун-та і на год высланы ў Быхаў пад нагляд паліцыі. У 1897 паступіў у Харкаўскі ун-т. Уваходзіў у Харкаўскую арг-цыю РСДРП. 28.10.1900 арыштаваны. 17.12.1900 высланы на радзіму пад нагляд паліцыі. Вёў рэвалюц. прапаганду сярод рабочых Быхава, арганізаваў нелегальны гурток. 17.11.1901 зноў арыштаваны і пасаджаны ў Магілёўскую турму. Вясною 1902 высланы на 3 гады ў Епісейскую губ. Адбыўшы ссылку, жыў у Харкаве, Варонежы.

М. В. Біч. Мінск.

БАБОВАКВЕТНЫЯ (Leguminosales, Fabales), парадак раслін тыпу пакрытанасенных. Дзвюхдольныя шматгадовыя, радзей аднагадовыя травы з прамастойным або павойным сцяблом; кусты, дрэвы, ліяны. На каранях Б. жывуць клубеньчыкавыя бактэрыі, якія засвойваюць азот з паветра. Лісце чаргаванае, у некат. відаў супраціўнае і кальчаковае, складанаперыстае, радзей простае з прылісткамі. Кветкі двухполыя, няправільныя (зігаморфныя) і правільныя, яркія, з падвойным калякветнікам. Суквецці: гронка, галоўка, мяцёлка, паўпарасонік. Плод — сухі струк. Насенне спецыфічнай формы і колеру, без эндасперму. Семядолі мясістыя, пры прарастанні насення астаюцца ў глебе або выносяцца на паверхню. Б. каля 18 тыс. відаў, у СССР 1800, у БССР больш за 100. Падзяляюцца на 3 сямействы: мімозавыя, цэзальпініевыя і матыльковыя.

Мімозавыя (Mimosaceae) — трапічныя і субтрапічныя дрэвы з перыстаскладаным лісцем і дробнымі правільнымі кветкамі. Пашыраны ў Паўд. паўшар'і. Вядома 56 родаў і 2800 відаў; сярод іх лекавыя, дубільныя, фарбавальныя, з каштоўнай драўнінай і дэкар. расліны. У СССР найбольш вядомыя: акацыя серабрыстая, мімозка, шаўковая акацыя, якія растуць у садах Крыма, Каўказа, і Сярэд. Азіі. Цэзальпініевыя (Caesalpiniaceae) — дрэвы, кусты, паўкусты, травы з чаргаваным перыстым лісцем і двухбаковымі прамяністымі кветкамі. Растуць пераважна ў тропіках. 152 роды і 2800 відаў. У СССР (Чарнаморскае ўзбярэжжа Каўказа, Карпаты) вырошчваюць касію (дае *александрыйскі ліст*), гледычыю і юдава дрэва (дэкаратыўныя), ранкоўае дрэва (дае ядомыя салодкія плады). Матыльковыя (Papilionaceae, Fabaceae) — травяністыя расліны, дрэвы, кусты. Лісце перыстае або пальчаткаскладанае. Кветкі з 5-пялёсткавым вяночкам, падобным да матылька. 483 роды і 12 тыс. відаў, пашыраных ва ўмераных абласцях зямнога шара. Матыльковыя маюць нар.-гасп. значэнне і як кармавыя расліны займаюць 2-е месца пасля алакаў. Сярод іх шмат каштоўных харч. раслін з пажыўным, багатым на бялок, крухмал і алей насеннем (фасоля, маш, гарох, сачавіца, боб, нут, соя, арахіс); кармавых і сідэральных (канюшына, люцэрна, баркун, лубін, рутвіца, сырадэля, віка, эспарцэт); лекавых (лакрыца, баркун жоўты, трагаканта-вая астрагалы, тэрмопсіс, сферафіза, стальнік калючы, пажытнік); інсектыцыдных (дэрыс, ланхакарпус, тэфразія, сафора); дэкар. і меданосных (пахучы гарошак, гліцынія, белая і жоўтая акацыя); лубяных, смаланосных, фарбавальных, ядавітых.

У БССР з матыльковых найбольш пашыраны: *гарох, канюшына, боб кармавы, лубін, люцэрна, сырадэля, фасоля, віка, эспарцэт.* Яны з'яўляюцца важнай крыніцай раслінна-бялковага корму для с.-г. жывёлы, адыгрываюць значную ролю ва ўтварэнні травастою сухадольных і заліўных лугоў, культурнай пашы і сенажацяў. Матыльковыя маюць высокую азотфіксавальную здольнасць, узбагачаюць глебы арган. рэчывамі і

азотам, што асабліва важна для паляпшэння ўрадлівасці пясчаных глебаў.

Літ.: Бобовые и зернобобовые культуры. [Сб. арт.], М., 1966; Биохимия бобовых растений, М., 1967; Определитель растений Белоруссии, Мн., 1967; Флора БССР, т. 3, Мн., 1950.

БАБОВІЧЫ, вёска ў Гомельскім р-не, на р. Уза. Цэнтр сельсавета і калгаса «Камуніст». За 25 *км* на Пд ад Гомеля. 1432 ж., двароў 461 (1970). Перапампоўчная станцыя нафтаправода «Дружба», шавецкая і швейная майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, 3 магазіны. Радзіма І. А. Хімакова — дзеяча парт. арганізацыі Лібава-Роменскай чыгункі, кіраўніка стачкі чыгуначнікаў Гомеля ў 1918 супраць нямецкіх захопнікаў. Ад рук нямфаш. захопнікаў загінула 29 мірных жыхароў вёскі, на франтах вайны — 146. Каля курганоў, вышэй вусця р. Уза, выяўлена стаянка неалітычнага часу, а на Пн ад яе — рэшткі мезалітычнага паселішча.



БАБОК (Menyanthes), род шматгадовых травяністых раслін сямейства бабковых. Сцябло выш. 15—30 *см*. Лісце трайчастае, на доўгіх чаранках. Кветкі бела-ружовыя ў форме зорачак. Суквецце — густая гронка. Плод — каробачка. Вядомы адзін від — Б. трохлісты (M. trifoliata), пашыраны ў краінах Паўн. паўшар'я. Расце на балотах, па берагах рэк і канаваў, утварае зараснікі. На Беларусі нар. назвы: бабоўнік, баброўнік, бобрык, трыліснік. Лісце Б. мае горкія гліказіды мянціцін і меліяцін, алкалоід генцыянін, вітамін С, дубільныя рэчывы. Настой з лісця ўжываецца ў медыцыне.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

БАБОЎКА, вёска ў Старарудзянскім с/с Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Бабоўскі». За 13 *км* на У ад Жлобіна, 96 *км* ад Гомеля, 7 *км* ад чыг. ст. Хальч. 382 ж., двароў 135 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У Айч. вайну вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі; загінула 16 мірных жыхароў, 5 партызанаў; на франтах вайны — 45 жыхароў. Помнік на брацкай магіле 66 сав. воінаў.

БАБОЎНЯ, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Бабоўня». За 15 *км* на ПнЗ ад Капыля, 120 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы, на скрыжаванні аўтамаб. дарог Капыль — Узда і Асіповічы — Баранавічы. 355 ж., двароў 108 (1970). Адда. раённага прамысл. камбіната, адда. камбіната быт. абслугоўвання. Пач. школа, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, адда. сувязі, магазін. Помнік на магіле сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБОШКА Канстанцін Мацвеевіч (н. 28.5.1918, в. Вялікія Будкі Лебядзінскага пав. Харкаўскай губ.), удзельнік баёў па Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1938. На фронце з ліп. 1941. Вызначыўся ў канцы 1943 у баях за вызваленне Смалепскай і Віцебскай абл. Пад камандаваннем гвардыі капітана Б. артыл. батарэя знішчыла 11 варожых танкаў, 3 гарматы, 3 мінамётныя батарэі, 14 кулямётаў. Жыве ў г. Запарожжа.

БАБРАМЫНІЧЫ, вёска ў Смаляпскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл., на р. Камяніца. Цэнтр калгаса «Зорка». За 30 *км* на ПнЗ ад Оршы, 110 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Смальяны, 93 ж., двароў 27 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

БАБРАНЯТЫ, вёска ў Баброўскім с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл., каля Прыпяці (3 *км*). Цэнтр калгаса імя Каліпіна. За 6 *км* на Пд ад Мазыра, 140 *км* ад Гомеля, 14 *км* ад чыг. ст. Мазыр. 362 ж., гасп. 93 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад, аддз. сувязі, магазін.

БАБРАЎНІКІ, вёска ў Чэхскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Звязда». За 20 *км* на ПпУ ад Астраўца, 270 *км* ад Гродна, 24 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 301 ж., двароў 104 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік воінам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БАБРОВА, вёска ў Маласавінскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл., у сутоку Баброўкі і Расасенкі. Цэнтр калгаса «Прагрэс». За 15 *км* на У ад Дуброўна, 122 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Асінаўка. 278 ж., двароў 87 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943—44 каля В. праходзіла лінія фронту, вёска была разбурана; загінула 73 яе жыхары. Помнік на брацкай магіле 1730 сав. воінаў, якія загінулі ў барацьбе з ням.-фаш. захопнікамі.

БАБРОВА, вёска ў Несінскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Баброва». За 25 *км* на ПнУ ад Лепеля, 82 *км* ад Віцебска, на шашы Лепель — Віцебск. 192 ж., двароў 75 (1970). Клуб. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБРОВА Марыя (парт. псеўд. Бронінай Марыі Аляксандраўны; 1897, в. Локшы Віцебскай губ.— 28.4.1920), адна з кіраўнікоў партыйнага падполля ў Бабруйску ў гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі. Чл. Камуніст. партыі. У пач. 1920 ЦК КП(б) Літвы і Беларусі паслаў Б. на ўмацаванне Бабруйскага падпольнага парт. к-та. Пад яе кіраўніцтвам створаны Ясеньскі падпольны раённы к-т, які аб'ядноўваў 15 парт. ячэек у Багушэўцы, Пацы, Осаве і інш. вёсках Бабруйскага пав. Па ініцыятыве Бабруйскага падпольнага парт. к-та арганізаваны партыз. атрады ў в. Сычкава, Любонічы, Бортнікі, Рымаўцы, Харлапавічы, Каменка і Падрэчча. 25.4.1920 польскія акупанты арыштавалі Б. на павятовай падпольнай парт. канферэнцыі, якая адбылася ў Бабруйску на яе кватэры. Пасля катаванняў расстраляна. Імем Б. названа вуліца ў Бабруйску.

БАБРОВІЦКАЕ, возера ў бас. р. Грыўды, левага прытока Шчары, у Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл. Пл. 9,47 *км²*. Даўж. 4,9 *км*. Найб. шыр. 3,5 *км*, сярэдняя 1,9 *км*, найб. глыб. 8 *м*, сярэдняя 2 *м*. Катлавіна нагадвае трохвугольнік. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя. У вадазборы (95,0 *км²*) пераважаюць пяскі і тарфянікі. Возера праточнае, у яго ўпадаюць 2 канавы, выцякае канал Дзевяты. Зах. і паўн. часткі возера вельмі зарастаюць трыснягом, чаротам, белымі гарлачыкамі. Водзяцца серабрысты карась, карп, шчупак, плотка, акунь, лешч.

БАБРОВІЧ Ян Станіслававіч (парт. псеўд. Сымон, Казік, Борскі; 2.6.1902, мяст. Параф'янава Вілейскага пав. Вілейскай губ.— 8.1.1943), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі. У 1922—25 вучыўся на мед. ф-це Пражскага ун-та і вёў камуніст. прапаганду сярод студэнтаў-беларусаў. У 1923 уступіў у Кампартыю Чэхаславакіі. У 1926 вярнуўся ў Зах. Беларусь. Кааптаваны ў ЦК КПЗБ, быў яго прадстаўніком пры ЦК *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ) і паліт.



рэдактарам яе газет *«Жыццё беларуса», «Беларуская ніва», «Беларуская справа», «Народная справа», «Наша справа»* і інш. На IV з'ездзе Кампартыі Польшчы выбраны канд. у чл. ЦК КПП. Арыштаваны ў Варшаве 23.2.1928. Прыгавораны ў Беластоку да 15 гадоў турэмнага зняволення. Пры абмене палітзняволенымі паміж СССР і Польшчай у вер. 1932 выехаў у СССР і працаваў у камісіі па вывучэнні Зах. Беларусі, створанай пры АН БССР. Сааўтар (з Я. Багданскім) брашуры «Аб класавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай сялянска-рабочай грамады» (1932). *М. С. Арэхва.* Мінск.

БАБРОВЫ СТРУМЕНЬ, сакрэт мускусных залоз рачнога бабра. Паўвадкая жаўтаватая маса з моцным пахам ляжалай лазы. Выпрацоўваецца парнымі мускуснымі залозамі, якія знаходзяцца ў брушной поласці. Маса залоз да 150 *г*. У мінулым Б. с. лічылі за цудадзейны сродак ад розных хвароб. Таму бабры былі амаль вынішчаны. Б. с. у медыцыне перастаў ужывацца. Яго выкарыстоўваюць у парфумнай прамысловасці на лепшыя гатункі духоў. *І. М. Сяржанін.* Мінск.

БАБРОК-ВАЛЫНСКІ Дзмітрый Міхайлавіч (г. н. і см. невяд., 2-я пал. 14 ст.), князь, военачальнік і ваявода вялікага маскоўскага князя Дзмітрыя Данскога; сын валынскага князя Карыята-Міхала Гедыміпавіча. Перайшоў на службу да Дзмітрыя Данскога з Вял. кн. Літ. У 1371 разбіў войска разанскага кн. Алега і далучыў Разань да Маскоўскага княства, у 1376 узначаліў паход маскоўскага войска супраць волжскіх балгар. У 1377 Б.-В. з серпухоўскім князем і б. полацкім кн. *Андрэем Полацкім* узначальваў паход супраць Вял. кн. Літ., у выніку якога ўзяты Трубчэўск і Старадуб. Асабліва вызначыўся ў *Кулікоўскай бітве* 1380. З серпухоўскім кн. Уладзімірам Храбрым узначальваў засадны полк, які своечасова напёс удар па татара-манголах, і гэта вырашыла вынік бітвы.

БАБРОЎ Іван Іванавіч (сак. 1905, в. Малышна Кашанскага пав. Цвярской губ.— 1.11.1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. Чл. КПСС з 1925. Скончыў Выш. школу партарганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1940). У 1919—28 рабочы, у 1930—38 на парт. рабоце (Ленінград). З сак. 1940 заг. прамысл. аддзела, з сак. 1941 сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б. У пачатку Айч. вайны палітработнік на Зах. фронце, выкладчык у ваен. школе. З жн. 1942 у аддзеле кадраў Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР), з ліст. 1942 у распараджэнні Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). З сак. 1943 памочнік упаўнаважанага БШПР па Брэсцкай вобл., сакратар Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б. Загінуў у баі з ням. фашыстамі ў в. Белавічы Косаўскага р-на Брэсцкай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі. *З. І. Бялуга.* Мінск.



БАБРОЎ Фёдар Аляксандравіч [22.2(6.3). 1898, в. Чакшы Люцынскага пав. Віцебскай губ.— 25.9.1944], савецкі ваенны дзеяч, ген.-м. (1942). Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў курсы «Выстрал» (1926), Вышэйшыя курсы зенітнай артылерыі (1932). З сак. 1940 нам. камандзіра, камандзір дывізіі. У Айч. вайну на Зах., Варонежскім, 1-м і 2-м Укр. франтах. Удзельнік абароны Масквы, фарсіравання Дняпра, Паўд. Буга, Днястра, Прута. Загінуў у баі, пахаваны ў Чарнаўцах. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



БАБРОЎКА, рака, левы прыток Дняпра. Даўж. 27 *км*. Пачынаецца на паўд.-зах. ускраіне Аршанска-Магілёўскай раўніны, цячэ ў Слаўгарадскім і Быхаўскім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (147 *км²*) пакатаўзгорысты, часткова забалочаны. Жыўленне

ракі мяшанае, пераважна снегавое. Сярэднегадавы расход вады ў вусці каля 0,8 *м³/сек.*

БАБРОЎНІКІ, група феадальна залежных сялян у Вялікім княстве Літоўскім (14—18 ст.), галоўным заняткам якіх было паляванне на баброў, здабыча футра, мяса і *бабровага струменю.* З развіццём фальваркавай гасп. паляванне на баброў, догляд іх угоддзяў, барацьба з браканьерствам ператварыліся ў феад. павіннасць спец. прызначаных сялян. У пекат. маёнтках Б. выконвалі і дадатковыя павіннасці: давалі *дзякло*, касілі сена, хадзілі на *талаку*, плацілі *чынш.* Зямельны надзел Б. у 16 ст. быў каля 1 валокі, пад сярэдзіну 18 ст. паменшыўся напалову. У сувязі з драпежніцкім вынішчэннем звяроў у 18 ст. бабровы промысел страціў эканам. значэнне. Павіннасці Б. заменены грашовымі плацяжамі, а самі яны зліліся з інш. групамі сялянства. У месцах, дзе захаваліся бабры, абавязкі Б. ускладзены на *асочнікаў.* Карыстанне бабровымі ўгоддзямі за плату феадалу футрам ці грашыма было адным з пашыраных дадатковых заняткаў *сялян-данікаў.* У 14—17 ст. Б. былі і на Украіне; у Сібіры яны захаваліся да 19 ст.

Літ.: Пичета В. И. Белоруссия и Литва в XV—XVI вв., М., 1961; Похилевич Д. Л. Крестьяне-слуги в Великом княжестве Литовском в XVII—XVIII вв., у кн.: Средние века, в. 21, М., 1962.

М. Ф. Спірыдонаў. Мінск.

БАБРОЎСКАЯ (Зэліксон) Цэцылія Самойлаўна [19.9(1.10).1876, г. Веліж Віцебскай губ.— 6.7.1960], дзеяч Камуністычнай партыі. Чл. КПСС з 1898. Агент «Искры». У 1903 далучылася да бальшавікоў. Вяла парт. работу ў Харкаве, Кастраме, Яраслаўлі, Цверы, Тыфлісе. У 1904 чл. Бакінскага к-та РСДРП. З 1905 на парт. рабоце ў Маскве: чл. Лефортаўскага райкома, сакратар Маскоўскага абл. бюро, сакратар акруговага к-та РСДРП. Неаднаразова была пад арыштам і ў ссылцы. Удзельніца Кастр. рэвалюцыі. З 1920 працавала ў ЦК РКП(б), з 1928 у Камінтэрне, з 1940 на навук. рабоце. Аўтар кніг «Старонкі з рэвалюцыйнага мінулага (1903—1908)» (1955), «Запіскі падпольшчыка. 1894—1917» (1957) і інш. Узнаг. ордэнам Леніна.

БАБРОЎСКІ (Bobrowski) Іаганес (9.4.1917, Тыльзіт — 2.9.1965), нямецкі паэт і празаік (ГДР). З сям'і чыгуначніка. Друкавацца пачаў у 1954. Аўтар зб. вершаў «Сармацкі час» (1961) і «Цяністая зямля патокаў» (1962), раманаў «Млын Левіна» (1964) і «Літоўскія клавіры» (1966), зб. навел «Перасцерагальны» (1967). Творчасці Б., прасякнутай антыфаш. ідэямі, уласцівыя глыбокая сац.-філас. праблематыка, багацце гістар. экскурсаў і рэмінісцэнцый, зварот да культуры і фальклору народаў Усх. Еўропы. Літ. прэмія імя Г. Мана Ням. акадэміі мастацтваў (1965).

Тв.: Бел. пер.— у зб.: Пярэдняя выйшлі ў заўтра, Мн., 1968; рус. пер.— Белендорф и литовские клавиры, М., 1969.

БАБРОЎСКІ Міхаіл Кірылавіч (8.11.1784 ці 1785, в. Вулька на Падляссі — 21.9.1848), беларускі славіст і археограф. Д-р тэалогіі (1823). Чл. Археал. акадэміі ў Рыме, Парыжскага і лонданскага азіяцкіх т-ваў, каміцэта (у Далмацыі) па выпрацоўцы харвацкага правапісу. З сям'і уніяцкага свяшчэнніка. Скончыў Віленскі ун-т (1812). У 1817—22 вывучаў слав. мовы і л-ры ў Празе, Вене, Любляне, Фларэнцыі, Венецыі, Рыме, Парыжы, Будзішыне, чытаў лекцыі па араб. філалогіі, збіраў і апісваў старасл. рукапісы. Праф. Віленскага ун-та, кіраўнік бел.-літоўскага філал. гуртка. У 1824 звольнены з ун-та за пашырэнне прагрэс. ідэй і асланы ў Жыровічы на Слонімшчыне пад нагляд паліцыі. У 1826 вярнуўся ў Вільню, выкладаў ва ун-це старасл. мову; выступаў супраць паланізацыі і лацінізацыі. Збіраў бел. рукапісы і кнігі, знайшоў і ўвёў у навук. ўжытак «Супрасльскі зборнік». Аўтар славіст. артыкулаў, прац «Пра характэрныя моўныя звароты беларускага народа» і «Гісторыя славянскіх друкарняў у Літве» (абедзве не збераглісь).

Літ.: Бобровский П. О. Михаил Кириллович Бобровский, СПб., 1889; его ж. К биографии М. К. Бобровского, СПб., 1890.

А. І. Мальдзіс. Мінск.

БАБРОЎСКІ Павел Восіпавіч [21.3(2.4).1832, маёнтак Вака Віленскага пав.— 1905], гісторык і этнограф. Чл.-супрацоўнік імператарскага рус. геагр. т-ва, сенатар, ген.-маёр. Скончыў Пружанскае дваранскае вучылішча (1844), Полацкі кадэцкі корпус (1849) і ваен. акадэмію (1857). Узначальваў юнкерскія вучылішчы, ваенна-юрыд. акадэмію (з 1875). Аўтар прац па гісторыі Гродзеншчыны, найбольш вядомыя «Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі генеральнага штаба. Гродзенская губ.» (ч. 1—2 + дадаткі ў 2-х т., 1863). У ёй сабраны матэрыялы па гісторыі гарадоў Гродзенскай губ., прамысл., с. гасп., землеўладанні і інш. Б. вывучаў таксама гісторыю летапісаў, ваеннай справы, царквы, права.

Тв.: Статистическое обозрение Гродненской губернии, у кн.: Историческое описание г. Гродно, Гродно, 1860; Юнкерские училища, т. 1—3, СПб., 1872—76; Судьба Супрасльской рукописи..., СПб., 1887; Еще заметка о Супрасльской рукописи, СПб., 1888; Русская греко-уніатская церковь в царствование императора Александра I, СПб., 1890.

Літ.: Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964, с. 65—69.

Я. Н. Мараш. Гродна.

БАБРУЙСК (летапісны Баброўск, Бабруесск, Бабрусеск), горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Вузел чыг. і шашэйных дарог, аэрапорт, прыстань на р. Бярэзіна. Другі па колькасці насельніцтва і прамысл. значэнні горад у вобласці. 138 тыс. ж. (1970).

У 5—6 ст. паблізу тэр. горада існавала слав. гарадзішча. У часы Кіеўскай Русі на месцы сучаснага Б. была вёска, жыхары якой займаліся рыбнай лоўляй і бабровым промыслам. Першыя пісьмовыя звесткі пра Б. адносяцца да сярэдзіны 14 ст., калі ён належаў мінскаму князю Скіргайлу, сыну Гедыміна. У сярэдзіне 16 ст. Бабруйскае староства лічылася ў спісках уладанняў вял. князя. Трызне. У 1639 аддадзена польскай каралеве Цэцыліі Рэнаце як пасаг. У Вял. кн. Літ. быў цэнтрам воласці, з 1566 — староства. Паводле перапісу 1620 у Б. было 409 дамоў, 75 крам, млын, войскі Вял. кн. Літ. на чале з кн. Сямёнам Алельковічам разбілі крымскіх і акерманскіх татар.

У час вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54 жыхары паўсталі супраць феадалаў (гл. *Бабруйска абарона 1649*). У 1793 Б. далучаны да Расіі. 3.5.1795 абвешчаны горадам і павятовым цэнтрам Мінскай губ. У чэрв. 1810 пачалося будаўніцтва *Бабруйскай крэпасці*, якая адыграла важную ролю ў Айч. вайне 1812. Тут былі вынявольны многія дзекабрысты і петрашэўцы. Пабудаваная ў 1848 Маскоўска-Варшаўская шаша і ў 1873 Лібава-Роменская чыгунка спрыялі развіццю прамысл. У пач. 20 ст. ў Б. было 19 фабрык і заводаў (чыгуналіцейны, лесапільныя, цагельныя, вінакурныя, маслабойныя, мылаварныя, тытунёвыя, мэблевая, млыны) з 582 рабочымі; 191 рамесная майстэрня — 1077 рамеснікаў; з трох тыс. пабудоў мураваных было 172. У 1897 налічвалася 35 100 ж. (59,4% былі непісьменныя), у 1913 — 41 300 ж.

Працоўныя горада актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюц. руху. У 1898 у Б. надрукаваны Маніфест I з'езду РСДРП. У 1904 створана *Бабруйская арганізацыя РСДРП(б)*, у 1905 *Бабруйская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП.* У гады грамадз. вайны і замежнай інтэрвенцыі ў Б. дзейнічаў партыйны падпольны к-т. За гады сацыяліст. буд-ва Б. стаў буйным прамысл. цэнтрам. У 1940 было больш за 100 прадпрыемстваў, на якіх працавала каля 10 тыс. рабочых. Пабудаваны дрэваапр. камбінат, швейная ф-ка, маш.-буд. завод і інш. У горадзе было 30 школ з 13 725 навучэнцамі і 527 настаўнікамі, 27 дзіцячых садоў і 11 ясляў, драм. і калгасны тэатры, 17 клубаў, 2 кінатэатры, 13 б-к, 3 бальніцы і 19 інш. мед. устаноў, у якіх працавала 396 мед. работнікаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. 28.6.1941 Б. акупаваны нямфаш. захопнікамі, якія ператварылі яго ў руіны і папялішчы, знішчылі прамысл. прадпрыемствы, эл. станцыі, мед. ўстановы, 10 школ, 10 клубаў і інш. Матэрыяльныя страты за час акупацыі склалі 471 720 тыс. руб. У Б. і яго ваколіцах было загублена больш за 100 тыс. сав. грамадзян (гл. *Бабруйскі лагер смерці*), многа вывезена ў Германію. Нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, насельніцтва гераічна змагалася з захопнікамі. У горадзе дзейнічалі падпольныя партыйна-патрыятычныя арг-цыі і групы, якія ўзначальвалі І. В. Стомаў, П. Ф. Маслёнак, В. І. Бутараў, І. А. Хімічаў, А. К. Калеснікаў, В. І. *Лівенцаў*, С. З. Крамнёў, М. Р. Баглай, У. К. Пінчук, Я. І. Савацееў, П. М. Сцяржанаў і інш. Барацьбу з ворагам узначальваў Бабруйскі падпольны райком КП(б)Б (сакратары Д. М. Лемяшонак, Г. Н. Акуліч). Вызвалены 29.6.1944 (гл. *Бабруйская аперацыя 1944*). У 1944—54 Б. цэнтр *Бабруйскай вобласці.*




Гасцініца «Бабруйск».

У прамысловасці Б. гал. месца займае дрэваапрацоўчая; самы вялікі ў рэспубліцы *Бабруйскі фанера-дрэваапрацоўчы камбінат* (піламатэрыялы, фанера, сталярныя вырабы, драўніннавалакністыя пліты). На адходах вытворчасці працуе гідралізны з-д (этылавы спірт, кармавыя дрожджы). Мэблевыя ф-кі імя Халтурына (гарнітуры спальныя, шафы, кухонная мэбля, крэслы) і № 2 (кухонная мэбля). Машынабудаванне: *Бабруйскі машынабудаўнічы завод, Бабруйскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання* (трактарныя прычэпы, раскідвальнікі ўгнаенняў); з-ды аўтатрактарных дэталяў, доследна-механічны (нестандартнае і гаражнае абсталяванне, прычэпы, паўпрычэпы), механічны (кормазапарнікі для жывёлагадоўчых фермаў), вагавы, суднарамонтны. Развіваецца хім. прамысловасць: *Бабруйскі завод гумавых тэхнічных вырабаў* (гума, гумавыя дэталі машын, брызол, рэлінавая плітка для дахаў і падлогі, рамонт аўташын і інш.); будуюцца (1970) адзін з найбольшых у краіне *Беларускі шынны камбінат* і ЦЭЦ-2. Прадпр. лёгкай і харч. прамысловасці: вялікі гарбарны камбінат, швейная ф-ка імя Дзяржынскага, трыкатажная, мастацкіх вырабаў, абутковая, люстравая, галантарэйная, футравых вырабаў, валюшна-лямцавая ф-кі, камбінат для перапрацоўкі другаснай сыравіны, кансервава-харчовы, мясакамбінат, хлебакамбінат, кандытарская ф-ка «Чырвоны харчавік», з-ды маслабойны імя Адаярыхі, малочны, вінаробны, сока-морсавы. Прамысл. буд. м. (з-ды цагельны № 9, зборнага жалезабетону).

Першы ген. план рэканструкцыі Б. зацверджаны ў 1936. Ген. планы 1949 і 1966

Бабруйск. Плошча імя Леніна.



вахавалі старую структуру Б. і вызначылі новыя шляхі развіцця горада. Гал. вуліцы, плошчы і агульнагарадскі цэнтр у раёне вуліц Савецкай, Сацыялістычнай, Інтэрнацыянальнай, Гогаля, Горкага забудоўваюцца шматпавярховымі дамамі. У паўн. і паўд.-вах. раёнах будуецца прамысл. комплекс. Горад добраўпарадкоўваецца і азеляняецца. Зона адпачынку — прыбярэжжа р. Бярэзіны.

Тэатр у Б. вядомы з 18 ст. У 1760 пры езуіцкім калегіуме працаваў школьны т-р. У 1852 трупа В. Дуніна-Марцінкевіча паказала «Сялянку». Пазней гастраліравалі польскія, рускія тэатр. трупы, акцёры М. Савіна, П. Арленеў, В. Папазян і інш. У 1920 сфарміраваны Другі паказальны тэатр. У 1932 быў створаны Дзярж. рус. драм. т-р, у 1935 Т-р рабочай моладзі, 1938 — *Бабруйскі калгасна-саўгасны тэатр*, 1944 — *Бабруйскі абласны рускі драматычны тэатр*, 1956 — *Бабруйскі вандроўны беларускі драматычны тэатр*. Працаваў (да 1970) *Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі*. Працуюць 2 нар. тэатры.

На пач. 1970 у Б. было 20 сярэдніх, 7 васьмігадовых, 1 завочная школа, 9 школ рабочай моладзі, 3 дзіцячыя спарт. школы, 2 муз. школы, 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў: тэхнікумы аўтатранспартны, лесатэхнічны, гумавай прамысл., сельскагаспадарчы; медыцынскае, 5 прафесіян.-тэхн. вучылішчаў, 4 кінатэатры, 22 клубы, 11 б-к. Вядомы ў рэспубліцы *Бабруйскі санаторый* імя У. І. Леніна. *Бабруйскі краязнаўчы музей*. У Б. — помнік У. І. Леніну (1969, скульпт. П. Белавусаў). Выдаецца газ. *«Камуніст»*.

Літ.: Бабруйск, Мн., 1965.
М. Ф. Шпакаў. Магілёў; *І. І. Трухан.* Мінск.

БАБРУЙСКА АБАРОНА 1649, абарона Бабруйска казакамі і гараджанамі ад войск феадалаў у час *вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*. У кастр. 1648 жыхары Бабруйска паўсталі і разам з казацкім загонам (атрадам) *Паддубскага* перабілі заможную шляхту, утапілі ў Бярэзіне гарадскога старосту. Калля сцен горада быў разбіты атрад Паца, пасланы для задушэння паўстання. У пач. студз. 1649 да Бабруйска падышлі 1,5 тыс. наёмнікаў і шляхты на чале з польным пісарам Вял. кн. Літ. У. Валовічам. 4 тыдні паўстанцы паспяхова адбівалі атакі шляхецкіх войск. На дапамогу Валовічу да Бабруйска падышоў атрад польнага гетмана Вял. кн. Літ. Я. Радзівіла. Паўстанцы адхілілі яго прапанову пра капітуляцыю. Радзівіл не адважыўся пачаць штурм сваімі сіламі і папрасіў дапамогі ў караля. Сваё войска ён размясціў за Бярэзінай. Скарыстаўшы розналоссі сярод паўстанцаў, ён схіліў на свой бок багатых мяшчан, гандляроў, рамеснікаў, духавенства. Ноччу 22.2.1649 здраднікі адчынілі вароты і з сем'ямі пакінулі горад. Войска Радзівіла ўварвалася ў горад і ўчыніла крывавую расправу. Паддубскі з невялікай групай казакоў зачыніўся ў драўлянай вежы і доўга адбіваўся, але быў схоплены і пасаджаны на кол. За час баёў было забіта некалькі тысяч гараджан і казакоў. Радзівіл не меў літасці нават да здраднікаў: «...да и мещан де всех, которые и город ему отворили, мучил из животов и руки отсек у 800 человек, постинал 150 ч., на паля повабіял больши 100 ч.» («Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России», т. 3, СПб., 1861, с. 298).

Літ.: Абецедарскі Л. С. Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII ст., Мн., 1954; История Белорусской ССР, т. 1, Мн., 1961, с. 171—173.


БАБРУЙСКАГА БАТАЛЬЁНА ПАЎСТАННЕ, выступленне салдатаў Бабруйскай крэпасці ў 1905 пад кіраўніцтвам *Бабруйскай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП*. 900 салдатаў дысцыплінарнага батальёна, у т. л. 300 рэвалюц. пастроеных матросаў Балтыйскага флоту, трымаліся на суровым рэжыме ў Бабруйскай крэпасці за рэвалюц. дзейнасць. 22.11.1905 тры роты батальёна (з чатырох) у знак пратэсту адмовіліся ісці на страявыя заняткі. Паўстанцы захапілі вінтоўкі, але без баявых патронаў, ультыматыўна патрабавалі ад нач. крэпасці вызваліць іх на працягу 5 дзён. Уночы 24.11.1905 беспаспяхова спрабавалі прарвацца ў горад. Паўстанне ў крэпасці ўзначальваў матрос Якушаў. Клязменскі і Крамлёўскі палкі Бабруйскага гарнізона пад уплывам бальшавіцкай агітацыі адмовіліся падаўляць паўстанне. Віленскі ген.-губернатар паслаў у Бабруйск карную экспедыцыю на чале з ген. Арловым. 25.11.1905 карнікі акружылі казармы з паўстанцамі і пад пагрозай артыл. абстрэлу прымусілі здацца. 10.2.1906 ваенны акруговы суд прыгаварыў 13 актыўных паўстанцаў да расстрэлу, 15 да катаргі. 10 засуджаным на смерць удалося ўцячы з дапамогаю Бабруйскай арг-цыі РСДРП і ваенна-рэвалюц. арг-цыі. Б. б. п. зрабіла значны ўплыў на рост рэвалюц. руху салдатаў інш. гарнізонаў.

Асада Бабруйска войскамі Я. Радзівіла. З гравюры 17 ст.



Літ.: Гл. пры арт. *Бабруйская арганізацыя РСДРП(б).* *М. Я. Шкляр.* Мінск.

БАБРУЙСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944, наступальная аперацыя войск 1-га Беларускага фронту (ген. арміі К. К. *Ракасоўскі*) 24—29.6.1944; састаўная частка 1-га этапа стратэгічнай *Беларускай аперацыі 1944* супраць ням.-фаш. войск. У Б. а. ўдзельнічалі 3-я, 28-я, 48-я, 65-я арміі (ген.-лейтэнанты А. В. *Гарбатаў*, А. А. *Лучынскі*, П. Л. *Раманенка*, П. І. *Батаў*), конна-механізаваная група (ген.-л. І. А. Пліеў), 16-я і 6-я паветраныя арміі (ген.-палк. авіяцыі С. І. Рудэнка і ген.-л. авіяцыі Ф. П. Палынін), *Дняпроўская ваенная флатылія* (капітан 1-га рангу В. В. Грыгор'еў); камандуючы артылерыі фронту ген. В. І. Казакоў, камандуючы бра-



Разбітая тэхніка ворага ў раёне Бабруйска.

нятанкавых і механізаваных войск ген. Г. Н. Арол. Мэта Б. а. — ударамі з двух раёнаў (3-я і 48-я арміі з раёна Рагачова ў напрамку Бабруйск — Асіповічы; 65-я, 28-я арміі і конна-механізаваная група з раёна на Пд ад Парыч у напрамку Старыя Дарогі — Слуцк) акружыць і разграміць жлобінска-бабруйскую групоўку акупантаў; потым развіць наступленне ў напрамках Асіповічы — Пухавічы — Мінск і Старыя Дарогі — Слуцк — Баранавічы. Карту гл. на ўкл.

Паводле загаду Гітлера ням. войскі павінны былі абараняць Бабруйскі ўмацаваны раён як «аснову нанава ствараемага фронту на Бярэзіне». Яго абараняла 9-я ням. армія (ген. Іардан, з 27 чэрв. — ген. фон Форман) у складзе 12 пяхотных, 1 танкавай дывізій, 2 артыл. палкоў, 14 асобных артыл. дывізіёнаў і інш. часцей, усяго каля 130 тыс. салдатаў і афіцэраў. Спалучаючы прыродныя перашкоды з абарончымі збудаваннямі, праціўнік стварыў на Бабруйскім напрамку моцную, глыбока эшаланіраваную абарону з мінамі палямі, надаўбнямі, драцянымі загародамі. Гал. паласа ўмацаванняў глыб. 6—8 км праходзіла па лініі Лудчыцы — Гута Раманяцкая — Хомічы — вах. бераг Друці — Азяраны — Верычаў — Задружжа — вах. бераг Дняпра да в. Праскурні — Ніва — Мормаль — Здудзічы — Карма — Колкі — вах. бераг Пцічы да Прыпяці. Дадатковыя ўмацаваныя палосы былі на р. Дабрыцы, Добасне, Але, Бярэзіне, вакол нас. пунктаў; абарончыя ўмацаванні з двума абводамі вакол Бабруйска і ў горадзе.


22 чэрв. ў маштабе фронту сав. войскі зрабілі разведку боем, якая ўдакладніла размяшчэнне агнявой сістэмы праціўніка на пярэднім краі. Пасля ўдараў авіяцыі і артыл. падрыхтоўкі ў 6 гадзін раніцы 24 чэрв. пачалося наступленне на абодвух участках. Войскі 65-й і 28-й армій прарвалі абарону




Савецкія байцы пераадольваюць лясіста-балоцістую мясціну ў раёне Бабруйска. Чэрвень 1944.

праціўніка ў першы дзень. Уведзены ў прарыў 1-ы танкавы корпус (ген. М. Ф. Паноў) паглыбіўся ў бок Бабруйска да 20 км і выйшаў у тыл парыцкай групоўкі ворага; 25 чэрв. ў бой уступіла конна-механізаваная група. 26 чэрв. 65-я армія выйшла да р. Бярэзіны на Пд ад Бабруйска, перарэзала каля в. Вялікая Каменка шашу Бабруйск — Слуцк, а 28-я армія вызваліла Глуск. 27 чэрв. сав. часці вызвалілі ст. Мірадзіна і перарэзалі чыгунку Бабруйск — Асіповічы. Наступленне 3-й і 48-й армій развівалася з вял. цяжкасцямі. Толькі пасля магутных бамбавых удараў 16-й паветр. арміі і ўводу буйных танкавых сіл 26 чэрв. абарона немцаў была зломлена на ўчастку 35-га і 41-га стралковых карпусоў (В. Г. Жолудзеў і В. К. Урбановіч). У выніку ўдалага манеўру 9-га танкавага корпуса (ген.-м. Б. С. *Бахараў*) захоплены адзіны каля Бабруйска мост цераз Бярэзіну і адрэзаны шляхі да адступлення ворага з рубяжа Жлобін — Рагачоў. На другі дзень часці 3-й і 48-й армій перарэзалі ўсе шашэйныя дарогі на ПпУ ад бабруйскага ўмацаванага раёна і каля в. Цітаўка злучыліся з 65-й арміяй, якая абышла Бабруйск з З і выйшла гал. сіламі да Бярэзіны на Пн ад горада. Утварыўся т. зв. *Бабруйскі «кацёл»*, у які трапіла 5 варожых дывізій (да 40 тыс. чал.). Сав. войскі 28 чэрв. вызвалілі Асіповічы і перарэзалі ворагу ўсе шляхі адступлення. 30.6.1944 быў вызвалены Слуцк. Акружаная групоўка праціўніка ўдарам

Савецкія воіны ўступаюць у Бабруйск.





Гітлераўцы, узятыя ў палон пад Бабруйскам. 1944.

пяхоты, танкаў і Дняпроўскай ваен. флатыліі была раздзелена на 2 часткі. Па варожых часцях, што падрыхтаваліся да прарыву каля в. Цітаўка, 27 чэрв. панеслі ўдар сав. авіяцыя, а потым танкі і пяхота. Група праціўніка на У ад р. Бярэзіны 28.6.1944 была ліквідавана. Варожаму гарнізону Бабруйска пасля трох моцных атак раніцай 29 чэрв. ўдалося прарвацца ў лес, дзе ён быў зноў акружаны і 1.7.1944 знішчаны. 29 чэрв. сав. войскі штурмам авалодалі Бабруйскам. Сав. войскам многа памагалі партызаны. Яны захоплівалі пераправы, вялі разведку ў тыле ворага, удзельнічалі ў баях па знішчэнні акружаных яго груповак.

У выніку Б. а. войскі 1-га Бел. фронту прарвалі абарону праціўніка на палосе 200 *км* і прайшлі наперад да 110 *км*, акружылі і ліквідавалі бабруйскую групоўку немцаў. За 6 дзён баёў былі разбіты гал. сілы 9-й ням. арміі: знішчана каля 50 тыс. і ўзята ў палон больш за 23 тыс. ням. салдатаў і афіцэраў, падбіта і захоплена 366 танкаў, больш за 5 тыс. гармат і мінамётаў, каля 16 тыс. аўтамашын і інш. Гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для наступлення сав. войск на Мінск і Баранавічы. Б. а.— адна з умела арганізаваных і выкананых аперацый у маштабе фронту. У выніку Б. а. 31 воінскае фарміраванне атрымала ганаровыя найменні: «Бабруйскіх» — 3 корпусы, 5 дывізій, 5 брыгад і 7 асобных часцей; «Слуцкіх» — 1 дывізія, 2 брыгады і 5 асобных часцей; «Жлобінскіх» — 1 дывізія, 1 брыгада, 1 асобная часць.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—1945, т. 4, М., 1962; Сообщения Советского Информбюро, т. 7, М., 1945; Маланьин К. А. Разгром врага в Белоруссии (1944 г.), М., 1961; Малинин М. О действиях войск 1-го Белорусского фронта в Белорусской наступательной операции (июнь — июль 1944 г.), «Военно-исторический журнал», 1959, № 7; Рокоссовский К. К. В боях за освобождение Белоруссии, «История СССР», 1961, № 5.

Р. М. Шавяла. Мінск.

БАБРУЙСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП(б), створана ў пач. 1904 на аснове іскраўскага гуртка, які існаваў у Бабруйску з лета 1903. З сак. 1904 уваходзіла ў Паўн.-Зах. к-т РСДРП. Дзялілася на 3 р-ны. У вер. 1905 аб'ядноўвала 80 чл. РСДРП і больш за 300 спачувальнікаў. Арганізатары Ф. В. *Сімончык*, Л. С. Галынскі, кіраўнік Г. Л. Шклоўскі. Агітацыйную і прапагандысцкую дзейнасць узначальвала калегія з 8 членаў арг-цыі. Трымала сувязь з Замежным бальшавіцкім цэнтрам, Пецярбургскім, Палескім к-тамі, Мінскай і інш. с.-д. арг-цыямі. Мела нелегальныя б-ку і друкарню. У горадзе было 8 палітгурткоў, у т. л. 3 ніжэйшыя (па 12 чал.), 2 сярэднія (па 35 чал.) і 3 вышэйшыя. У пытанні пра скліканне III з'езду партыі арганізацыя падтрымлівала бальшавікоў. Прадстаўнік ЦК партыі М. М. Літвінаў, які прыязджаў у Бабруйск, 12.10.1904 пісаў У. І. Леніну запіску: «Бабруйская група, якую я азнаёміў днямі са становішчам спраў у партыі, спачувальна адносіцца да нашых лозунгаў і будзе нас падтрымліваць». Па заклiку Б. а. РСДРП 16.1.1905 у Бабруйску адбыліся стачка і мітынг пратэсту супраць расстрэлу рабочых у Пецярбургу, а 29.1.1905 усеагульная забастоўка. Пад яе кіраўніцтвам на працягу сак. 1905 былі праведзены 3 узброеныя дэманстрацыі; праходзілі першамайская палітычная стачка, летнія забастоўкі салідарнасці з барацьбой пралетарыяту Масквы, Пецярбурга, Лодзі, Іванава-Вазнясенска, Адэсы; выступленні рабочых Бабруйска ў кастр. і снеж. 1905; мітынг пратэсту з выпадку *курлоўскага расстрэлу*. Пад уздзеяннем рэвалюц. работы Б. а. РСДРП у вёсках павета адбыліся выступленні сялян, забастоўкі батракоў у маёнтках Міхалёва, Бортнікі, Вакулічы, Яннікі, Хмяльное, Бялліна, Варанцоўка. З кастр. 1905 пры Б. а. РСДРП існавала *Бабруйская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП*, якая вяла работу сярод салдатаў Бабруйскага гарнізона, узначальвала *Бабруйскага батальёна пайстанне* ў 1905 (22—25 ліст.), выступленне салдатаў артыл. парку (30.9.1906). Са студз. 1904 да студз. 1905 выдадзена і распаўсюджана 9 назваў лістовак тыражом больш за 10 тыс. экз. Прадстаўнікі Б. а. РСДРП удзельнічалі ў рабоце з'езду партарганізацый Паўн.-Зах. к-та, 1-й абл. канфер. арг-цый РСДРП Паўн.-Зах. краю (жн. 1905), канфер. прапагандыстаў партарганізацый Паўн.-Зах. краю (вер.— кастр. 1905), II (ліст. 1905) і III (май — чэрв. 1906) з'ездаў арг-цый Паўн.-Зах. саюза РСДРП. З канца 1905 увайшлі ў РСДРП. З канца 1905 увайшлі ў рэпрэсіі ўлад. 29.12.1905 паліцыя выкрыла явачную кватэру і захапіла марксісцкую л-ру. 28.3.1906 чл. Б. а. РСДРП В. Сяргееў за агітацыю сярод салдатаў прыгавораны да 10 гадоў катаргі.

27.5.1906 на чыг. ст. Асіповічы арыштаваны экспедытар арг-цыі П. Яфрэмаў, які вёз у Слуцк пракламацыі абласнога к-та Паўн.-Зах. саюза РСДРП; 2.10.1906 па данасе правакатара арыштаваны кіраўнікі Бабруйскай ваенна-рэвалюц. арг-цыі; 24.11.1906 раскрыта і ліквідавана друкарня. У гады рэакцыі, а потым 1-й сусв. вайны рэвалюц. дзейнасць Б. а. РСДРП значна аслабела. Пасля Лют. рэв. ў Бабруйску ўзнікла аб'яднаная арганізацыя РСДРП [17(30).4.1917]; у жн. 1917 бальшавікі стварылі Бабруйскую арганізацыю РСДРП(б). У камітэт былі выбраны І. М. Кузякоў (старшыня), А. А. *Брэгман*, П. М. Серабракоў, Н. Я. Бральніцкі, М. Ліпуноў, Ф. Н. Пурсэ. У вер. 1917 Бабруйская арг-цыя (187 чл.) увайшла ў склад Паўн.-Зах. к-та РСДРП(б).

Кр.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.), Мн., 1934; Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.), т. 3, Мн., 1953; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1962.

Літ.: Бобруйск, Мн., 1965; Симончик Ф. В. В огне трех революций, Мн., 1964.

У. В. Скарабагаты. Мінск.

БАБРУЙСКАЯ ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП, група сацыял-дэмакратаў, якая вяла рэвалюцыйную работу сярод салдатаў Бабруйскага гарнізона. Створана 31.10.1905 пры *Бабруйскай арганізацыі РСДРП(б)*. Кіраўнікі Л. С. Галынскі, К. Ісаева, Н. Пагадзіцкая, чл. Кустановіч, Рубінштэйн, Р. Шнеерсон, Ясеневў. Пасля ўтварэння *Ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі пры Абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі* дзейнічала пад яе кіраўніцтвам. Стварала нелегальныя гурткі, арганізоўвала сходы і мітынгі, распаўсюджвала лістоўкі і бальшавіцкую ваен. газету «Казарма». Узначальвала *Бабруйскага батальёна пайстанне* ў ліст. 1905, а ў лют. 1906 выпусціла лістоўку з пратэстам супраць прыгавору актыўных пайстанцаў да пакарання смерцю. Разам з Бабруйскай арг-цыяй РСДРП падрыхтавала ўцёкі 10 смяротнікаў. У сярэдзіне 1906 выпусціла лістоўку «Да салдатаў Бабруйскага гарнізона», а ў вер. арганізавала выступленне салдатаў артыл. парку за дэмабілізацыю прызыўнікоў 1903, якое закончылася іх перамогай. 2.10.1906 кіраўнікі ваенна-рэвалюц. арг-цыі былі арыштаваны, арг-цыя перастала існаваць.


Літ.: Гл. пры арт. *Бабруйская арганізацыя РСДРП(б).*

М. Я. Шкляр. Мінск.

БАБРУЙСКАЯ ВОБЛАСЦЬ БССР, існавала з 20.9.1944 да 8.1.1954. Цэнтр — г. Бабруйск. У склад Б. в. ўваходзіла 14 раёнаў: Бабруйскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Асіповіцкі, Грэскі, Капыльскі, Чырвонаслабодскі, Любанскі, Слуцкі, Старобінскі, Старадарожскі, Глускі, Акцябрскі, Парыцкі; 4 гарады, 8 гар. пас., 193 сельсаветы. Тэрыторыя 19,7 тыс. *км²*. Насельніцтва: у 1941 — 806 136 чал., у 1944 — 517 949, у 1953 — 654 895 чал. Напярэдадні Айч. вайны на тэр. Б. в. дзейнічалі 21 эл. станцыя, 57 прадпр. саюзнага і рэсп. падпарадкавання, 144 прадпр. мясцовай прамысл. кааперацыі; 1200 калгасаў, 8 саўгасаў, 37 МТС, у якіх было 1500 трактароў. Былі 2 пед. вуч., лесатэхнікум, 2 мед. школы, больш за 1000 сярэдніх, сямігадовых і пач. школ, драматычны тэатр, каля 200 Дамоў культуры, клубаў, хатчытальняў, бібліятэк, 30 гар. і раённых бальніц, 17 амбулаторый, 57 урачэбных участкаў, 2 санаторыі. За час акупацыі з 26.7.1941 да 30.6.1944 ням. захопнікі разбурылі, спалілі і разрабавалі 19 эл. станцый, 813 будынкаў прамысл.-выт. прызначэння, 6180 жывёлагадоўчых памяшканняў, 930 школ, 349 мед. і дзіцячых устаноў, 6 вялікіх бібліятэк, краязнаўчы музей. Прамысл. абсталяванне, інвентар, жывёла былі вывезены ў Германію. Прадпрыемствам, калгасам прычынены страты на 7 815 236 931 руб. Гітлераўцы загубілі на тэр. вобласці каля 140 тыс. мірных жыхароў і ваеннапалонных. За пасляваенныя гады адноўлены прамысл. прадпр., эл. станцыі, арцелі прамысл. кааперацыі. 234 прадпр. вобласці ў 1953 вырабілі таварнай прадукцыі на 698 565 тыс. руб., або ў 2,5 раза больш, чым да вайны. Адноўлены ўсе калгасы, МТС. У 1,5 раза павялічаны пасевы збожжавых, тэхн. культур, бульбы. Павысілася ўраджайнасць збожжавых у 2 разы, бульбы ў 1,5, пагалоўе жывёлы выросла ў 1,5 раза. Вобласць поўнасцю забяспечвала сябе прадуктамі і таварамі шырокага ўжытку. За яе межы вывозіліся бульба, агародніна, садавіна, лён. У 1953 у Б. в. было 1007 сярэдніх, сямігадовых і пач. школ, у якіх вучылася 130 тыс. чал., працавала 6 тыс. настаўнікаў. У 1949 адкрыты настаўніцкі ін-т (Бабруйск), фармацэўтычная, фельчарская, гандлёвая школы, пед. вучылішча; працавалі 2 школы ФЗН, 4 рамесныя вуч., аўтатранспартны, лесатэхнічны, с.-г. тэхнікумы; дзейнічалі драм. т-р, 13 Дамоў культуры, 240 клубаў, хат-чытальняў і бібліятэк, Дом піянераў, станцыя юных натуралістаў, каля 300 мед. і дзіцячых устаноў. Выдаваліся абласная і 14 раённых газет. За мужнасць і гераізм у Айч. вайну 25 бабруйчанам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, а танкісту С. Ф. *Шутаву* — двойчы. За поспехі ў развіцці с. гасп. тром калгаснікам прысвоена званне Героя Сац. Працы. На ўсю краіну праславіўся калгас «Рассвет», якім кіраваў Герой Сав. Саюза і Герой Сац. Працы К. П. *Арлоўскі*. Пасля ліквідацыі Б. в. Акцябрскі і Парыцкі р-ны ўвайшлі ў Гомельскую вобл.; Глускі, Грэскі, Капыльскі, Чырвонаслабодскі, Любанскі, Слуцкі, Старобінскі, Старадарожскі — у Мінскую; Бабруйскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Асіповіцкі — у Магілёўскую.

У. П. Церашчук. Бабруйск.

БАБРУЙСКАЯ КРЭПАСЦЬ, пабудавана паводле ўказа Аляксандра I ад 4.6.1810 у час падрыхтоўкі да вайны з Францыяй. Да 1812 збудавана 5 асн. бастыёнаў, да 1820 — астатнія 17. Б. к. адыграла значную ролю ў *Айчыннай вайне 1812*. Камандуючы 2-й рус. арміі П. І. Багратыён 18—21.7.1812 за сценамі крэпасці даў салдатам адпачынак, прывёў у парадак армію, назапасіў харчоў, боепрыпасаў, пакінуў тут раненых. Невялікі гарнізон



Адзін з бастыёнаў Бабруйскай крэпасці, пабудаваны ў 1810.

крэпасці на працягу 4 месяцаў вытрымаў асаду 20-тысячнага корпуса напалеонаўскага ген. Яна Дамброўскага. Б. к. адводзілася значнае месца ў планах паўстання дзекабрыстаў. У 1823 тут была раскватаравана 9-я пяхотная дыв., палкамі якой камандавалі будучыя дзекабрысты М. П. *Бястужаў-Румін*, С. І. *Мураўёў-Апостал*, В. С. Нораў, І. С. Павала-Швайкоўскі. Яны распрацавалі т. зв. бабруйскі план паўстання, якім прадугледжваліся арышт цара і яго світы ў час агляду войск у Б. к.; адначасова выступленне Паўночнага т-ва, Маскоўскай управы і дзекабрыстаў у Тульчыне; захоп Кіева і паступленне на Маскву; ліквідацыя самадзяржаўя, стварэнне Часовага рэвалюц. ўрада і ўстанаўленне ў Расіі бурж.-дэмакр. рэспублікі. З-за непадрыхтаванасці арміі, недахопу сіл і сродкаў, розагалоссяў паміж дзекабрыстамі і інш. прычын бабруйскі план быў адхілены. Пасля задушэння паўстання ў Б. к. былі арыштаваны дзекабрысты С. І. Трусаў, В. К. Тызенгаўзен, П. А. Бястужаў, І. Р. Бурцаў і інш. У казематах крэпасці пакутавалі петрашэўцы К. І. Цімкоўскі, А. І. Мядзведзеў. 22—25.11. 1905 у Б. к. адбылося паўстанне салдатаў дысцыплінарнага батальёна (гл. *Бабруйскага батальёна паўстанне*). У кастрычніку 1917 гарнізон крэпасці поўнасцю перайшоў на бок бальшавікоў і прыняў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні Сав. улады на Бабруйшчыне. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі ператварылі крэпасць у лагер смерці і знішчылі тут каля 60 тыс. сав. грамадзян і ваеннапалонных (гл. *Бабруйскі лагер смерці*). У чэрв. 1944 сав. войскі акружылі і знішчылі варожы гарнізон крэпасці. Гл. *Бабруйская аперацыя 1944*.

Літ.: Гл. пры арт. *Бабруйск*.

У. П. Церашчук. Бабруйск.

БАБРУЙСКАЯ МІНЕРАЛЬНАЯ КРЫНІЦА, радовішча мінеральных водаў у Бабруйску Магілёўскай вобл. На яго базе створаны *Бабруйскі санаторый* імя У. І. Леніна. Воды з гідрагенкарбанатных пясчанікаў і дэвонскіх вапнякоў з гіпсамі залягаюць на глыб. 175—280 *м*. Эксплуатуюцца з дапамогай свідравін. Паводле хім. саставу вылучаюць 2 тыпы водаў. Хлавыя (з самаазлівам) з мінералізацыяй 6,6 *г/л* выкарыстоўваюцца ў халодным, падагрэтым і газіраваным стане як пітныя і лячэбныя пры страўнікава-кішачных хваробах. Хларыдна-натрыева-кальцыевыя (больш глыбокія) з мінералізацыяй 19,4 *г/л* — для ваннаў і ў сумесях з гразямі для лячэння хвароб апорна-рухальнага апарату і інш.

П. А. Кісялёў. Мінск.

БАБРУЙСКІ АБЛАСНЫ РУСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР, створаны ў 1941. З пач. Айч. вайны перастаў існаваць, у 1944 аднавіў дзейнасць. Маст. кіраўнік К. *Стэцкі*, з 1945 М. Кавязін. Спектаклі: «Жыццё вучыць» В. Галаўчынера, «Любоў Яравая» К. Трапёва, «За тых, хто ў моры!» Б. Лаўрэнёва, «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага, «Прыязджайце ў Званкавое» А. Карнейчука, «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага, «Каварства і каханне» Ф. Шылера, «Дамаевідзімка» П. Кальдэрона. У 1947 т-р пераведзены ў Гродна. Гл. *Гродзенскі абласны драматычны тэатр*.

БАБРУЙСКІ ВАНДРОЎНЫ БЕЛАРУСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР, створаны ў чэрвені 1956 для абслугоўвання насельніцтва сельскіх раёнаў рэспублікі. Спачатку называўся Бабруйскі бел. вандроўны калг.-саўг. т-р, з 19 сак. 1958 — Бабруйскі вандроўны бел. драм. т-р. Асн. база была ў Бабруйску. Маст. кіраўнік А. *Аркадзьеў*. Трупа складалася з акцёраў Белдзяржэстрады, выпускнікоў Бел. дзярж. тэатр.-маст. ін-та, удзельнікаў маст. самадзейнасці. Сярод іх: Т. Бандарчык, У. Бузук, Г. Вавула, Я. Гоўша, М. Курзо, Г. Лаўроў, П. Масцераў, Ф. Марцінкевіч, Л. Мацкевіч, І. Падляхоўскі, Ф. Паўзун, Ф. Пуховіч, І. Сухарукаў, Л. Федчанка, М. Ярмоленка. Творчую вучобу з калектывам праводзіў таксама Дз. *Арлоў*, які паставіў спектаклі «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага (1958) і «Дзядзька Ваня» А. Чэхава (1959). Асн. месца ў рэпертуары займала бел. драматургія: «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Цені знікаюць» С. Свірыдава, «Нячыстая сіла» Г. Стафанскага, «Чалавек вярнуўся», «Любоў, Надзея, Вера» П. Васілеўскага і інш. Ставіліся рус. і ўкр. сав. п'есы: «Князь Мсціслаў Удалы» І. Прута, «Вясёлка» і «Антэй» М. Зарудnага, «Іван Буданцаў» В. Лаўрэнцьева, «Вяселле ў Малінаўцы» Б. Аляксандрава. У 1962 рэарганізаваны ў Бабруйскі муз.-драм. т-р, з 1965 па 1970 існаваў як *Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі*.

Літ.: Нлфёд У. І. Сучасны беларускі тэатр, Мн., 1961.

С. А. Пятровіч. Мінск.

БАБРУЙСКІ ЗАВОД ГУМАВЫХ ТЭХНІЧНЫХ ВЫРАБАЎ, прадпрыемства гумавай прамысловасці. Выпускае 19 відаў прадукцыі (1970): прафіляваныя пратэктары, рэгенерат, брызол, гумавы лінолеум і інш., узнаўляе аўтапакрышкі метадам накладкі пратэктара. Пабудаваны ў 1948—50 для вытворчасці натуральнага каўчуку. Калі быў адкрыты спосаб атрымання сінтэтычнага каўчуку, часова пераабсталяваны для рэгенерацыі гумы. За сямігодку 1959—65 здадзены ў эксплуатацыю магутнасці па вытворчасці буд. матэрыялаў, фармавых і нефармавых гумава-тэхн. выробаў, напорных рукавоў з піцевай аплёткай, па рамонце аўташын метадам накладкі по-

вых пратэктараў. У 1969 выпушчана прадукцыі на 48 млн. 200 тыс. руб. (на 4 млн. 390 тыс. руб. больш, чым у 1968). Пры з-дзе прафілактарый, 4 дашкольныя дзіцячыя ўстановы, базавая н.-д. лабараторыя нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці СССР.

Літ.: Калач А. С., Костевич М. А. и Черепович С. Е. В новых условиях хозяйствования, Мн., 1969.

А. П. Хіманыч. Бабруйск.

БАБРУЙСКІ ЗАВОД СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН, прадпрыемства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання. Засн. на базе рамонтна-механічнага з-да (1961). Асн. прадукцыя: трактарны універсальны прычэп ІПТУ-3,5 і прыстасаванне для раскідвання мінер. угнаенняў РКМ-500. У 1969 выпушчана прадукцыі на 9 млн. 994 тыс. руб.— на 1 млн. 351 тыс. руб. больш, чым у 1965. Прадукцыя з-да ўдастоена ў 1966 Залатога медаля на Сусв. выстаўцы с.-г. машын у Маскве. На 1971 намечана рэканструкцыя, магутнасць з-да вырасце ў 10 разоў.

Б. П. Лапенка. Бабруйск.


БАБРУЙСКІ КАЛГАСНА-САЎГАСНЫ ТЭАТР, створаны ў лютым 1938, існаваў да 1941. Маст. кіраўнік М. Лягоцін. Акцёры: Р. Грузд, С. Гуняжэнка, Я. Кімберг, Г. Латоцкая, Г. Панкрат, А. Тарасава і інш. Пастаноўкі: «Пагранічнікі» У. Біль-Белацаркоўскага, «Не было ні гроша, ды раптам шастак» А. Астроўскага, «Прафесар Паляжаеў» Л. Рахманава, «Васа Жалязнова» М. Горкага, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Ірынка» К. Чорнага.

БАБРУЙСКІ «КАЦЁЛ», аперацыя войск 1-га Беларускага фронту па знішчэнні часцей 9-й нямецкай арміі, акружаных пад Бабруйскам 27.6.1944. Моцным ударам сав. войск варожая групоўка была раздзелена на 2 часткі: на У ад р. Бярэзіны (ліквідавана 28.6.1944, знішчана 10 тыс., узята ў палон 6 тыс. салдатаў і афіцэраў) і гарнізон у самім Бабруйску, які прарваўся ў навакольныя лясы (ліквідаваны 1.7.1944, знішчана больш за 10 тыс. чал.). Гл. *Бабруйская аперацыя 1944*.

БАБРУЙСКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ заснаваны ў 1924 краязнаўцам Ц. Я. Славіным. У фондах і залах музея каля 20 тыс. экспанатаў. Аддзелы: прырода, гісторыя дасавецкага і сав. перыядаў. У аддзеле прыроды экспанаты расліннага і жывёльнага свету зоны, карысныя выкапні. У аддзеле гісторыі дасавецкага перыяду прадметы археал. раскопак на тэр. Бабруйшчыны, матэрыялы пра стараж. Бабруйск, у т. л. пра *Бабруйска абарону 1649*, *Бабруйскую крэпасць*; калекцыі зброі і абмундзіравання рус. і франц. армій пач. 19 ст.; дакумент. экспанаты пра дзейнасць дзекабрыстаў у Бабруйску (С. І. Мураўёва-Апостала, М. П. Бястужава-Руміна, В. С. Норава, І. С. Павала-Швайкоўскага, В. К. Тызенгаўзена і інш.); пра стварэнне і дзейнасць *Бабруйскай арганізацыі РСДРП(б)*, *Бабруйскай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП*, пра *Бабруйскага батальёна паўстанне* ў 1905; макет дома, у якім надрукаваны маніфест І з'езду РСДРП. Аддзел гісторыі сав. перыяду мае раздзелы: Бабруйшчына 1917—40, Вял. Айч. вайна 1941—45, пасляваен. сацыяліст. буд-ва. У першым раздзеле экспанаты пра партыз. рух на Бабруйшчыне ў перыяд яе акупацыі кайзераўскімі і белапольскімі войскамі, пра *Рудабельскую рэспубліку* і яе кіраўнікоў (А. Р. *Салаўя*, М. Ф. *Уса*, С. Р. *Жынка*, П. Ц. Шантыра, Е. А. Падуту і інш.). Спец. стэнд прысвечаны М. І. Калініну, які ў чэрв. 1919 на чале агітпоезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» наведаў Бабруйск. У раздзеле Вял. Айч. вайны рэчавыя экспанаты, фотаздымкі і дакументы пра партыз. рух, падпольную дзейнасць парт. і камсамольскіх арг-цый на акупаванай тэр. Бабруйшчыны, пра вызваленне краю ад ням.-фаш. захопнікаў, *Бабруйскую аперацыю 1944*. Сярод экспанатаў дыярамы «Бой каля станцыі Татарка», «Ліквідацыя Бабруйскага «катла», электрыфікаваная карта акружэння бабруйскай групоўкі праціўніка. У раздзеле пасляваен. сацыяліст. будаўніцтва паказаны дасягненні працоўных у развіцці прамысл. і с. гасп., узоры прамысл. вытворчасці, макеты забудовы мікрараёна ў Бабруйску, калгаса «Гігант» у в. Вялікія Бортнікі і інш. У 1968 музей наведала каля 54 тыс. чал.

С. М. Філіпава. Бабруйск.

Бабруйскі краязнаўчы музей.



БАБРУЙСКІ ЛАГЕР СМЕРЦІ, створаны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў акупаваным Бабруйску летам 1941 для знішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных. Пад канец года ў ім было каля 60 тыс. ваеннапалонных, з іх больш за 20 тыс. жылі пад адкрытым небам. Ад голаду, холаду, антысанітарных умоў у лагеры ўспыхнула эпідэмія сыпнога тыфу. Каб заразіць здаровых ваеннапалонных, гітлераўцы пасялялі да іх у баракі хворых. У кастр.— ліст. 1941 за суткі паміралі па 600—800 чал., зімой да 1 тыс. Цяжка хворых фашысты вывозілі разам з мёртвымі і закопвалі. Пад выглядам пераводу ў іншыя лагеры або пры падазрэнні ў падрыхтоўцы да ўцёкаў праводзіліся масавыя расстрэлы. 7.11.1941 у лагеры было ўчынена запланаванае вялікае злачынства: паводле загаду прадстаўніка вярхоўнага камандавання германскай арміі палкоўніка Штурма начальнік лагера Рэдэр і яго нам.

Лангут падпалілі баракі. Людзей, якія выбягалі з падпаленых будынкаў, фашысты расстрэльвалі з кулямётаў. За некалькі гадзін загінула (агарэла і было расстраляна) больш за 4 тыс. чал. 3200 паўраздзетых палонных у снеж. 1941 пад выглядам адпраўкі ў Мінск пагрузілі ў таварныя вагоны і на адкрытыя платформы. Усе яны па дарозе змерзлі, трупы іх былі скінуты пад адхон. З жн. 1941 да жн. 1942 знішчана каля 40 тыс. чал. Лагер увесь час папаўняўся цывільнымі вязнямі. Да студз. 1944 былі знішчаны ўсе ваеннапалонныя. У лагеры асталося 5 тыс. цывільных вязняў, якіх вызваліла Сав. Армія.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944, 2 изд., Мн., 1965, с. 356—363; Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—19 января 1946 г.), Мн., 1947, с. 20—28, 339—387, 452, 453; Немецко-фашистский оккупационный режим (1941—1944 гг.), М., 1965, с. 321.


З. І. Бялуга. Мінск.

БАБРУЙСКІ МАШЫНАБУДАЎНІЧЫ ЗАВОД імя У. І. Леніна, прадпрыемства машынабудаўнічай прамысловасці, спецыялізаванае на выпуску помпавага абсталявання. Засн. ў 1898. Выпускаў вулічныя ліхтары. У першыя гады Сав. улады рэканструяваны і ўпершыню ў СССР пачаў выпускаць землепадрыхтоўчыя машыны-бегуны, а таксама гідратурбіны для сельскіх эл. станцый, шаравыя млыны. У Айч. вайну разбураны. У 1945 адноўлены і даў першую прадукцыю. З 1953 спецыялізуецца на выпуску цэнтрабежных помпаў для горнарудной, металург., хім., энерг. і інш. галін прамысловасці. Асвоіў выпуск больш як 80 відаў помпаў, у т. л. землясоса маркі 2ОГРТ-8, які можа падаць больш за 4 тыс. $м^3$/*гадз* руды з вадой на вышыню да 70 *м*, і багернай помпы маркі 12ПР-8Т2, якая прызначаецца для эксплуатацыі на буйных ЦЭС. Прадукцыя з-да ідзе таксама ва ўсе саюзныя рэспублікі і ў заруб. краіны. За 1953—69 выпуск прадукцыі павялічыўся ў 7,3 раза. Пры з-дзе турысцкая база, піянерскі лагер, дзіцячыя сад-яслі.

Г. С. Югаў. Бабруйск.

БАБРУЙСКІ РАЁН, у складзе Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на ПдЗ вобл. ў ніжнім цячэнні Бярэзіны. Пл. 1,6 тыс. $км^2$. Нас. 182,3 тыс. чал. (з Бабруйскам, 1969). 12 сельсаветаў, рабочы пас. Глуша. Цэнтр г. Бабруйск.

Большая частка раёна заплята Цэнтральнабярэзінскай раўнінай (сярэдняя выш. 140—150 *м* над узр. м.), складзенай з водналедавіковых пяскоў і супескаў. Па далінах р. Бярэзіны азёрна-рачныя і балотныя пясчана-гліністыя адклады. На Пд тэр. раёна займае нізіна Гомельскага Палесся. Месцамі трапляюцца невысокія марэнныя грады. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу—23,7 млн. *т* (у т. л. радовішча Рэдкі Рог — 13 млн. *т*), 4 радовішчы глін для цэглы і дрэнажных труб — 1,6 млн. $м^3$ (у т. л. радовішча Пабокавічы — 1,4 млн. $м^3$), ёсць мінер. воды. Сярэдняя т-ра студз. ад —6,5° да —7,0, ліп. 18,0—18,5 °С. Ападкаў 585 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 195 дзён. З Пн на Пд у раёне цячэ Бярэзіна з невял. прытокамі (Ала, Ваўчанка, Продвінка і інш.). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (51%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (26%), дзярнова-забалочаныя (3%), тарфяна-балотныя (8%), алювіяльныя тарфяна-балотныя (7%), алювіяльныя дзярнова-балотныя (4%). З мінеральных глебаў сугліністых 32,2%, супясчаных 51,0, пясчаных 16,8%. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 45 (цана бала 0,24 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 30, усіх с.-г. угоддзяў — 39. Пад лесам 38% тэрыторыі. Найбольшыя лясныя масівы на ПдЗ раёна і левабярэжжы Бярэзіны; пераважае хвоя (гал. ч. на Пд раёна), з ліставых — бяроза, асіна, вольха. Насяляюць раён беларусы, рускія, ёсць яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. нас. 114 чал. на 1 $км^2$, у т. л. сельскага 34 чал. на 1 $км^2$. Каля 70% насельніцтва ў Бабруйску.



Прамысловасць сканцэнтравана пераважна ў Бабруйску. Найбольшыя прадпрыемствы ў раёне: гута ў рабочым пас. Глуша (вытв. бутэлек), торфапрадпрыемства «Рэдкі Рог». Для мясцовых патрэб раёна важнае значэнне маюць райпрамкамбінат (вытв. цэглы, шыферу і інш.), раённы камбінат быт. абслугоўвання, лясгас, міжраённае аб'яднанне «Сельгастэхніка». У раёне 13 калгасаў і 9 саўгасаў (1969).

Калгасы і іх цэнтры: «Гігант» (*Вялікія Бортнікі*), імя XXII з'езду КПСС (*Бабруйск*), імя Дзяржынскага (*Міхалёва 1-е*), імя Мічурына (*Цялуша*), імя Аляксандра Неўскага (*Кавалі*), імя Някрасава (*Іванаўка*), «Перамога» (*Плёсы*), «Прагрэс» (*Туркі*), імя Пушкіна (*Варатынь*), «Сцяг камуны» (*Ламбава*), імя Фрунзе (*Стасейка*), «Шлях да камунізма» (*Хімы*), «Шлях Леніна» (*Слабада*). Саўгасы і іх цэнтры: «Бабруйскі» (*Гарбацэвічы*), «Гарохаўскі» (*Гарохаўка*), «Дойнічава» (*Дойнічава*), «Кіслялевічы» (*Юбілейны*), імя Леніна (*Леніна*), імя Ленінскага камсамола (*Брожа*), «Осава» (*Осава*), «Плодагадавальніцкі» (*Бабруйск*), птушкафабрыка (*Вішнёўка*).


С. гасп. спецыялізуецца пераважна на малочна-мясной жывёлагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 48% тэрыторыі. У раёне асушана (на 1968) 12 тыс. *га* балотаў і забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1968) склала 49,8, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі (жыта, пшаніца, ячмень, авёс і інш.) 22,2, бульбай 10,0, тэхнічнымі (лён) 1,6, пад кармавымі культурамі 15,5 тыс. *га*. Пагалоўе (тыс. галоў, 1969): буйн. раг. жывёлы 38,7 (у т. л. кароў 20,9), свіней 25,9, авечак і коз 3,5. Тэр. раёна перасякаюць чыгунка і шаша Мінск — Гомель; чыг. ветка Бабруйск — г. п. Акцябрскі. Шашэйныя дарогі злучаюць Бабруйск з Магілёвам, Светлагорскам, Слуцкам і інш. гарадамі. Важнае гасп. значэнне мае суднаходства па Бярэзіне.

У Б. р. на пач. 1970 (без г. Бабруйска) 17 сярэдніх, 11 васьмігадовых, 52 пач. школы; 7 школ рабочай і сельскай моладзі, 10 дашкольных устаноў, Дом піянераў, дзіцячая спарт. школа, спецшкола, 40 масавых б-к, 59 клубных устаноў, 54 кінаўстаноўкі (у т. л. 43 стацыянарных); 5 бальніц, паліклініка, 29 фельч.-ак. пунктаў, 2 фельч. мед. пункты на прамысл. прадпрыемствах. На пач. 1970 у раёне працавала 696 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 89 інжынераў, 105 аграномаў, заатэхнікаў, вет. урачоў і лесаводаў, 30 эканамістаў, 46 урачоў, 397 настаўнікаў і інш.; 1210 чал. з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Выдаецца газ. «*Камуніст*» (гарадская і раённая).

І. І. Трухан. Мінск.

Дом культуры
калгаса імя Дзяржынскага ў в. Міхалёва 1-е.






Дойны статак у летнім загоне калгаса імя XXII з'езду КПСС.

БАБРУЙСКІ САНАТОРЫЙ імя У. І. Леніна, бальнеалагічны санаторый на ўскраіне г. Бабруйска. За 5 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна, на правым беразе р. Бярэзіна, у парку. 4 корпусы, 400 ложкаў. Утвораны ў 1946 на базе дома адпачынку для лячэння нервова-саматычных хвароб, з 1950 для хворых з парушэннямі апорна-рухальнага апарату і перыферычнай нервовай сістэмы, з 1961 — з парушэннямі страваваль на-кішачнага тракту. Для лячэння выкарыстоўваюцца мясцовыя прыродныя фактары: хларыдна-натрыевыя мінер. воды (на ванны) і хларыдна-сульфатна-натрыева-кальцыевыя (пітныя); сапрапелевыя гразі. Сезон — цэлы год. У водагразелячэбніцы вуглякіслыя, радонавыя, кіслародныя, хвойныя, жамчужныя, субаквальныя ванны, кішачныя прамыванні, душы, гразелячэнне. Кабінеты: фізіятэрапеўтычны, рэнтгенаўскі, фізкультурны, масажны; лабараторыі: клінічная і біяхімічная. Шырока выкарыстоўваюцца аэратэрапія і дыэтатэрапія.

Я. Ф. Калітоўскі. Мінск.

БАБРУЙСКІ ФАНЕРА-ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства для комплекснай перапрацоўкі драўніны. Выпускае больш за 100 відаў прадукцыі (піламатэрыялы, фанеру, паркет, драўніннавалакністыя

Уборка бульбы ў калгасе «Гігант».



пліты, сталярныя вырабы і інш.). Будаваць пачалі ў 1926. У 1929 выдаў першую прадукцыю. У 1930 поўнасцю здадзены ў эксплуатацыю (3 лесапільныя цэхі, цэх стандартных дамоў, з-д для вырабу фанеры і беладрэўны цэх). У той час камбінат быў адным з самых вялікіх у Еўропе дрэваапр. прадпрыемстваў і пастаўляў лесаматэрыялы для буд-ва многіх гарадоў і індустр. цэнтраў краіны. У Айч. вайну разбураны. У 1944 адноўлены і пачалі даваць прадукцыю лесапільны і фанерны цэхі. Пазней рэканструяваны цэхі клеенай фанеры і дрэваапрацоўкі, пабудаваны з-д драўніннавалакністых пліт, цэхі струганай фанеры і п'езатэрмапластыкаў. У 1957 у склад камбіната ўвайшоў мэблевы цэх (б. арцель «Прагрэс»). У 1969 выпусціў прадукцыі на 22 млн. 510 тыс. руб.— на 2 млн. 435 тыс. руб. больш, чым у 1968. Прадукцыя камбіната пастаўляецца таксама ў інш. рэспублікі і на экспарт. Будуецца цэх паркетных дошак (1970). Пры камбінаце працуюць лесатэхн. тэхнікум, Палац культуры, санаторый-прафілакторый, камбінат быт. абслугоўвання, піянерскі лагер, дзіцячая муз. студыя, 3 дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

А. А. Санчукоўскі. Бабруйск.

БАБРУК Сяргей Антонавіч [2(15).2.1901, в. Шубічы Пружанскага пав. Гродзенскай губ.— 18.3.1962], Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1929. Скончыў кавалерыйскія курсы каманднага саставу ў Цверы (1921). На франтах Айч. вайны з 23.6. 1941. З 1944 камандзір стралковай дывізіі ў складзе 3-га Укр. фронту. Вызначыўся пры ліквідацыі пікапальскай групоўкі ворага. Дывізія пад камандаваннем Б. з 31.1 да 12.2.1944 прарвала моцную абарону гітлераўцаў, знішчыла каля 2100 варожых салдатаў і афіцэраў, многа баявой тэхнікі, у т. л. 9 танкаў і самаходных гармат, захапіла 14 складаў з боепрыпасамі, гаручым і прадуктамі. З 1960 ген.-л. Б. у запасе.



БАБРЫ, вёска ў Мазырскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». За 3 *км* на Пд ад Мазыра, 136 *км* ад Гомеля і 4 *км* ад чыг. ст. Козенкі, на шашы Мазыр — Лельчыцы. 1319 ж., двароў 299 (1970). Мазырскае адда. «Сельгастэхніка», міжкалгасбуд, механізаваная калона № 86 трэста «Захадэлектрасеткабуд». Васьмігадовая школа, б-ка, клуб, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Недалёка ад Б. выяўлены радовішчы спавжыўной солі. На брацкай магіле помнік сав. воінам, якія загінулі ў барацьбе з пям.-фаш. захопнікамі.

БАБУК Уладзімір Вікенцьевіч [н. 14(26).6. 1897, в. Навасёлкі Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі хірург. Д-р мед. н. (1937), праф. (1938), засл. дз. нав. БССР (1948). У 1921 скончыў мед. ф-т Казанскага ун-та. У 1923—24 заг. Ігуменскага павятовага аддзела аховы здароўя. У 1924—26 ардынатар, 1926—32 асістэнт і старшы асістэнт, 1932—37 дац., 1937—41 праф., заг. кафедры агульнай хірургіі Мінскага мед. ін-та. У 1941—43 заг. кафедры факультэцкай хірургіі Кіргізскага мед. ін-та, 1943—49 заг. кафедры агульнай хірургіі, 1949—62 заг. кафедры аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі Мінскага мед. ін-та. З 1962 праф.-кансультант. Асн. працы: эксперымент. вывучэнне траўматычнага шоку, хірург. лячэнне астэаміэліту, спантаннай гангрэны. Распрацаваў метады лячэння вострай прамянёвай хваробы, апендыкулятарных інфільтратаў, апёкаў і інш. Старшыня праўлення Беларускага навук. т-ва хірургаў (1960—67), старшыня Вучонага савета Мін-ва аховы здароўя БССР (1962—66), чл. праўлення Усесаюзнага навук. т-ва хірургаў. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Травматический шок и острые кровопотери, Мн., 1953; Оперативная хирургия, Мн., 1962.

БАБУЛЬЧЫН, старадаўні рускі сорт яблыні. Плады плясната-круглявыя, сакаўныя, кісла-салодкія, з белай мякаццю. Пладаносіць на 8—10-ы год, у 20—25 гадоў дае больш за 100 *кг* пладоў з дрэва. Ляжаць да мая. Сорт зімастойкі, не баіцца паршы і гнілі. Раяніраваны ва ўсіх зонах БССР. Найлепшыя апыляльнікі: *Антонаўка звычайная* і Штрыфель.

БАБУНІЧЫ, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на Пн ад Петрыкава, 215 *км* ад Гомеля, 14 *км* ад чыг. ст. Муляраўка. 364 ж., двароў 110 (1970). Сярэдняя школа, б-ка, дзіцячыя яслі, мед. пункт. У Вял. Айч. вайну Б. спалілі фашысты, загінула 60 жыхароў. Помнік сав. воінам, партызанам і аднавяскоўцам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАБУШКІН Іван Васілевіч [15(27).1.1873, с. Ледзенгскае Тоцемскага пав. Валагодскай губ.— 31.1.(13.2).1906], прафесіянальны рэвалюцыянер. З сям'і салявара. З 1883 працаваў у Пецярбурзе. У 1894 пазнаёміўся з У. І. Леніным і стаў яго адданым вучнем і паплечнікам, чл. *Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа».* У 1896 арыштаваны і высланы пад нагляд у паліцыі ў Екацярынаслаў. Удзельнічаў у стварэнні Екацярынаслаўскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» і газеты «Южный рабочий». Летам 1900 па заданні У. І. Леніна арганізоўваў у гарадах Зах. Расіі пункты для транспарціроўкі нелегальнай л-ры з-за мяжы. Жыў у Смаленску, Полацку, адкуль налажыў сувязь з марксістамі Палтавы, Екацярынаслава, Масквы. З вясны 1901 у Падмаскоўі; агент і карэспандэнт «Искры», аўтар прапагандысцкіх артыкулаў і лістовак. На Беларусі былі вядомы яго лістоўкі: «Што такое сацыяліст і палітычны злачынец», «У абарону іванава-вазнясенскіх рабочых». У ліп. 1902 уцёк з-пад арышту ў Лондан, там напісаў «Успаміны». У кастр. 1902 вярнуўся ў Расію, працаваў у Пецярбургскім к-це РСДРП. У студз. 1903 арыштаваны і высланы ў Верхаянск. Вызвалены па амністыі 1905. Быў чл. Іркуцкага, потым Чыцінскага к-таў РСДРП. Пры перавозцы зброі іркуцкім рабочым яго схапілі карнікі і на ст. Мысавая Забайкальскай чыгункі расстралялі без суда і следства. У некралогу, прысвечаным Б., Ленін пісаў: «Без такіх людзей рускі народ застаўся б назаўсёды народам рабоў, народам халопаў. З такімі людзьмі рускі народ заваюе сабе поўнае вызваленне ад усякай эксплуатацыі» (Тв., т. 16, с. 340). На ўшанаванне памяці рэвалюцыянера г. Мысоўск перайменаваны ў Бабушкін. Яго імем названа адна з вуліц Полацка.



Літ.: Воспоминания И. В. Бабушкина. 1893—1900 гг., М., 1955; Новоселов М. А. Иван Васильевич Бабушкин. 1873—1906, М., 1954; Мишкевич Г. И. Иван Васильевич Бабушкин [1873—1906], 3 изд., Л., 1963. *В. І. Яфрэмава.* Мінск.

БАБЧЫН, вёска ў Рудакоўскім с/с Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 12 *км* на Пд ад Хойнікаў, 122 *км* ад Гомеля, 17 *км* ад чыг. ст. Хойнікі, 27 *км* ад прыстані Аравічы на Прыпяці. 684 ж., двароў 217 (1970). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін. Абеліск на ўшанаванне памяці 19 аднавяскоўцаў, закатаваных ням.-фаш. захопнікамі ў Айч. вайну.

БАБЫЛІ, група беззямельных сялян на Беларусі ў 16—19 ст. Назва перайшла з Маскоўскай Русі, дзе Б. вядомыя з 15 ст. як збяднелыя феадальна залежныя людзі. Звычайна жылі на чужой зямлі і за карыстанне ёю плацілі гаспадару бабыльшчыну (невялікі аброк). Займаліся таксама рамеснічтвам, вазніцтвам, дробным гандлем, работай па найме ў маёнтках, будах, рудніх. Шукаючы работы, часта надоўга пакідалі двор і сям'ю. Да сярэдзіны 17 ст. не плацілі падаткаў, потым выконвалі *цягло* ў палавінным памеры сялянскай гаспадаркі. Паводле ўказа 1679 пра замену пазямельнага падатку падворным, а ў 1724 — падушным Б. ў Расіі выконвалі павіннасці нароўні з інш. сялянамі і як асобная праслойка перасталі існаваць. На Беларусі тэрмін Б. быў больш пашыраны ва ўсх. раёнах; на захадзе беззямельных сялян часцей называлі халупнікамі, бо ўся іх маёмасць складалася з хаты (халупы) і невялікай колькасці жывёлы; найбольш бедныя, бяздомныя сяляне ў 16—18 ст. вядомыя таксама пад назвай кутнікі. На Беларусі ў 16—18 ст. Б. не адраблялі панщчыны, не плацілі аброку; адзіным іх абавязкам было плаціць т. зв. паседзінкі памерам 2—4 злотых за год. У статуце Чачэрскага старостава 1754 запісана: «Выходзячы з таго, што зямлі яны не маюць, а хаты толькі ў некаторых сёлах, бабылі вызваляюцца ад панщчыны, данінны і розных работ. Яны абавязаны толькі з кожнай хаты плаціць паседзінкі памерам 4 злотых». Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй на Б. быў ускладзены падушны падатак. У 2-й пал. 19 ст. яны канчаткова зліліся з сялянствам. Тэрмін Б. захаваўся, але набыў іншы сэнс: адзінокія, бядотныя, збяднелыя людзі.

Літ.: Греков Б. Д. Крестьяне на Руси с древнейших времен до XVII века, 2 изд., кн. 2, М., 1954; Сербина К. Н. К вопросу о бобылях, у зб.: Академику Б. Д. Грекову ко дню семидесятилетия, М., 1952; Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв., Львов, 1957. *В. І. Мялешка.* Мінск.

БАББІНА, возера ў бас. р. Начы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., на ПдУ ад в. Бабынічы. Пл. 0,5 *км²*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (4 *км²*) узгорысты, марэнны. Воз. эўтрофнага тыпу, пратокай злучаецца з воз. Бабынічы. Водзяцца лешч, шчупак, язь, судак, плотка.

БАББІНІЧЫ, возера ў бас. р. Начы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., каля в. Бабынічы. Пл. 0,5 *км²*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Вадазбор (79,8 *км²*) узгорысты, марэнны. Воз. праточнае, упадае Быстрыца, выцякае Нача. Водзяцца шчупак, плотка, лешч, акунь, лінь, язь.

БАББІНІЧЫ, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., паміж азёрамі Бабынічы і Бабына на З і Нясета на У. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Мялешкі. За 40 *км* на ПдЗ ад Полацка, 145 *км* ад Віцебска, 17 *км* ад чыг. ст. Загацце. 146 ж., двароў 52 (1970). Сярэдняя школа, клуб, 2 б-кі, бальніца, аптэка, адда. сувязі, магазін. Калгас названы імем першага старшыні М. З. Мялешкі, забітага кулакамі ў 1930. У Вял. Айч. вайну вёску спалілі фашысты, загінула 110 жыхароў. Помнік сав. воінам і партызанам.

БАБ-ЭЛЬ-МАНДЭБСКІ ПРАЛІЎ, паміж паўд.-зах. ускрайкам Аравійскага п-ва і Афрыкай. Злучае Чырвонае м. з Адэнскім заліваім Аравійскага м. Найменшая шыр. 26,5 *км*, найменшая глыб. на фарватэры 182 *м*. У самым вузкім месцы в-аў Перым.

БАВАРСКАЯ САВЕЦКАЯ РЭСПУБЛІКА (БСР), абвешчана 13.4.1919 у перыяд рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі, які разгарнуўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. Пасля *Лістападаўскай рэвалюцыі 1918* да ўлады ў Баварыі прыйшлі правыя сацыял-дэмакраты. Іх здрадніцкая палітыка абвастрыла класавую барацьбу. Рабочыя патрабавалі перадаць уладу Саветам. Не маючы сілы задушыць рэвалюц. выступленні, правыя сацыял-дэмакраты 7.4.1919 абвясцілі т. зв. Савецкую Рэспубліку, якая фактычна была сродкам ашуканства працоўных. Каб усталяваць адкрытую бурж. дыктатуру, контррэвалюцыя арганізавала мяцеж. Узбр. рабочыя Мюнхена разграмілі яго, стварылі Камітэт дзеяння (орган вярхоўнай

улады рэспублікі) і Выканаўчы Савет на чале з камуністамі, абвясцілі 13.4.1919 БСР. Новы ўрад, узначалены камуністам Я. Левінэ, устанавіў рабочы кантроль над прадпрыемствамі, нацыяналізаваў банкі, стварыў Чырв. Армію, Надзвычайную камісію для барацьбы з контррэвалюцыяй, арганізаваў размеркаванне прадуктаў сярод працоўных. Але парада У. І. Леніна пра паляпшэнне становішча бяднейшых сялян і стварэнне саюзу рабочага класа і сялянства не была выканана. У такіх умовах і пры падтрымцы герм. ўрада Эберта — Шэйдэмана баварская контррэвалюцыя перамагла. 1.5.1919 БСР была разгромлена.

Літ.: Ленін У. І. Прывітанне Баварскай Савецкай Рэспубліцы, Тв., т. 29 (Полн. собр. соч., т. 38); Полтавский М. А. Баварская Советская Республика, М., 1959; Beyer H. Von der November-revolution zur Räterepublik in München, Berlin, 1957.

А. І. Казлоў. Мінск.

БАВАРСКІЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЗБОРЫ КАРЦІН, аб'ядноўваюць усе мастацкія музеі і галерэі зямлі Баварыя (ФРГ). Найбольш значныя калекцыі сабраны ў мюнхенскіх галерэях: Старой пінакатэцы (заходнееўрап. жывапіс 14—18 ст.), Новай пінакатэцы і Новай дзярж. галерэі (заходнееўрап. жывапіс 19—20 ст.), Шакаўскай галерэі (жывапіс. ням. рамантызму 19 ст.). Да Б. дз. з. к. належаць збор ням. жывапісу 15—16 ст. у Аўгсбурзе, а таксама галерэі заходнееўрап. жывапісу 15—18 ст. у Ашафенбурзе, Бамберзе, Рэгенсбурзе, Шлейсгейме і 5 невялікіх калекцый. У галерэях Б. дз. з. к. каля 13 тыс. карцін, пераважна ням. і підэрл. школ. Аб'яднанне галерэй Баварыі адбылося ў 1918.

БАВАРЫЯ (Bayern), зямля на Пд ФРГ. Пл. 70,6 тыс. км². Нас. 10,3 млн. чал. (1967). Адм. ц. Мюнхен. Амаль усю тэр. Б. займаюць Баварскае пласкагор'е і Франконскі Альб. На Пд — Альпы (г. Цугшпітцэ, 2963 м). Невял. радовішчы жалезнай руды, смаліста-га і бурага вугалю, солі, графіту, нафты. Клімат умераны. Гал. рэкі — Дунай з прытокамі — выкарыстоўваюцца на вытворчасць гідраэлектраэнергіі. На Пд многа азёраў. Б.— індустрыяльна-аграрны раён. Развіты электратэхнічная, маш.-буд., тэкст., харч., хім. прамысловасць, транспартнае машынабудаванне. Найбольшыя гарады Мюнхен, Нюрнберг, Аўгсбург, Рэгенсбург, Вюрцбург. 53% тэр. выкарыстоўваецца ў с. гасп. (1962). Вырошчваюцца збожжавыя, бульба, цукр. буракі, хмель, агародніна, вінаград. Жывёлагадоўля пераважна малочнага кірунку.

БАВАЎНЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна тэкстыльнай прамысловасці, якая вырабляе пражу, тканіны (паркаль, бязь, сацін, мэблева-дэкаратыўную, ворсавую, ручніковую, тэхнічную), ніткі, корд і інш. вырабы з бавоўны. Асн. вытв. Б. п.: прадзільная, ткацкая, круцільна-нітачная і фарбавальна-аддзелачная.

На Беларусі ў пач. 19 ст. (мяст. Зялёны Прудок Магілёўскай губ.) узнікла баваўняная прадпрыемства саматужнага тыпу, якое выраблялa хусткі і папяровую тканіну. Да 1-й сусв. вайны пабудавана баваўнаткацкая ф-ка «Дняпроўская мануфактура» у Дуброўне. Усяго на Беларусі было 327 ткацкіх станкоў, з іх 198 механічных.

Значна развілася Б. п. за гады Сав. улады. У 1940 у параўнанні з 1913 выпуск баваўняных тканін на Беларусі павялічыўся ў 7,6 раза. У Айч. вайну прадпрыемствы Б. п. былі разбураны. У 1945 выпушчана 0,1 млн. м баваўняных тканін, у 1965 — 8,4 млн. м. У 1960—69 пабудаваны *Баранавіцкі баваўняны камбінат*, у 1963—67 *Гродзенская баваўнапрадзільная фабрыка*. У Ветцы на базе арцелі «Чырвоны тэкстыльшчык» (засн. ў 1949) выраслa баваўнапрадзільная ф-ка. Баваўняную прадукцыю (абрусы, коўдры, хусткі, парцьерную тканіну і інш.) выпускаюць Віцебская, Слуцкая, Дзяржынская, Талачынская, Слонімская, Кобрынская, Рэчыцкая, Веткаўская, Кармянская тэкстыльныя ф-кі. На 1.1.1970 на Беларусі было 412 тыс. баваўнапрадзільных верацён і больш за 4500 ткацкіх станкоў.

У СССР каля 300 баваўняных прадпрыемстваў, якія вырабляюць больш за 680 артыкулаў тканін. Найбольшыя камбінаты: Камышынскі, Ташкенцкі, Глухаўскі, Херсонскі, «Трохгорная мануфактура» (Масква), Барнаульскі, Раднікоўскі, Іванаўскі меланжавыя і інш. Па выпуску баваўняных тканін СССР займае 2-е месца ў свеце.

Вытворчасць баваўняных тканін у СССР і БССР в 1913 да 1969 г. (у млн. м)

	1913	1940	1950	1960	1968	1969
СССР	2672	3954	3899	6387	7561	6210*
БССР	1,2	9,1	1,6	4,7	51,9	73,5*

* У млн. м².

З сацыяліст. краін найбольш баваўняных тканін выпускаюць Польшча, Чэхаславакія: у 1968 адпаведна 835 і 506 млн. м². Сярод капіталіст. краін па вытворчасці баваўняных тканін і пражы 1-е месца займаюць ЗША. (У 1968 выраблена 7,2 млрд. м тканін.)

Літ.: Перский Д. И. Организация и планирование хлопчатобумажного производства, М., 1966; Вайдюк П. В. и др. Технологический режим переработки хлопка-сырца советских сортов, М., 1968; Просвирнина А. Н. (сост.). Опыт работы Барановичского хлопчатобумажного комбината, М., 1966.

В. А. Мухіна. Мінск.

БАВАЎНЯНАЯ ТКАНІНА, тканіна, якая вырабляецца з баваўнянай пражы. Разнастайная па структуры, характары аддзелкі (напр., суравая, набіўная, *меланжавая тканіна*), па прызначэнні (бытавая і *тэхнічная тканіна*). Большая частка асартыменту — тканіны быт. прызначэння: на бялізну, вопратку, падкладачныя, мэблева-дэкаратыўныя і інш. Пераважна вырабляюць бязь, сацін, міткаль (пасля набіўкі і фарбавання — паркаль). Б. т. найб. танныя; яны носкія, моцныя і гігіенічныя, але камечацца і дэфармуюцца. Карыстаюцца ўстойлівым попытам насельніцтва. Гл. таксама *Баваўняная прамысловасць*.

БАВОЎНА, валакно, якое ўкрывае насенне расліны бавоўніку; сыравіна для тэкстыльнай, а таксама хімічнай, авіяцыйнай і іншых галін прамысловасці. З Б. вырабляюць тканіны, трыкатаж, прывадныя і транспарцёрныя пасы, швейныя ніткі, вяроўкі, канаты, марлю, вату, рыбалавецкія сеткі, снасці і інш. Валокны Б.— асобныя клеткі, якія складаюцца пераважна з цэлюлозы. На адным каліве насення развіваецца 7—15 тыс. валокнаў. У залежнасці ад батанічнага віду бавоўніку адрозніваюць сярэдневалакністую і тонкавалакністую Б. Якасць яе ацэньваецца паводле стандартаў. Б. падзяляецца на 7 гатункаў (адборны і 1—6-ы), іх вызначаюць па даўжыні (інтэрвал паміж гатункамі 1 мм) і трываласці валокнаў.

Да Кастр. рэвалюцыі Б. вырошчвалася пераважна ў Туркестане і Закаўказзі, валавы збор яе не перавышаў 700—750 тыс. т. Гэта не задавальняла патрэб Расіі, Б. завозілі з-за граніцы. У гады Сав. улады баваўнаводства хутка развіваецца. У 1940 валавы збор Б.-сыру склаў 2,24 млн. т. СССР займае 1-е месца ў свеце па ўраджайнасці і 2-е па вытв. Б. Сав. селекцыянеры вывелі новыя сарты бавоўніку, валакно якіх мае высокую якасць і вялікую даўжыню. Ураджайнасць Б.-сыру выраслa з 10,8 ц/га ў 1913 да 22,5 ц/га ў 1969, а плошча пасеваў павялічылася з 688 тыс. га да 2539,7 тыс. га. У 1969 валавы збор Б. ў СССР дасягнуў 5,71 млн. т, што поўнасцю задавальняе патрэбы краіны і дае магчымасць вывозіць Б. на экспарт. Галоўныя раёны баваўнаводства: Узбекская (⅔ агульнай колькасці Б.), Таджыкская, Туркменская, Азербайджанская, Кіргізская ССР, паўд. раёны Казахстана. Многа Б. вырошчваюць ЗША, Індыя, Бразілія і інш. краіны. Гл. іл. на ўкл. да арт. *Тэхнічныя культуры*.

Літ.: Хлопчатник, т. 1—4, Ташкент, 1954—60; Справочник по хлопководству, Ташкент, 1965; Достижения науки по хлопководству, Ташкент, 1968.

Л. С. Слуко, У. Ф. Тарасевіч. Мінск.

БАВЭ Восіп Іванавіч [24.10(4.11).1784, Пецярбург — 21.7(2.8).1834], рускі архітэктар. Прадстаўнік рускага класіцызму пачатку 19 ст. Вучыўся ў школе Экспедыцыі Крамлёўскага будавання (1802—09) у М. Казакова. Стаў на чале «Камісіі для будаванняў» у Маскве (пасля пажару 1812), у якой быў створаны праект адзінай арганізацыі цэнтра горада. Б. праводзіў ідэю стварэння цэласных арх. ансамбляў. Яму належаць найб. значныя замыслы: рэканструкцыя Краснай плошчы (1814—17), Тэатральная плошча (1816—24) з Пятроўскім (Вялікім) тэатрам (з арх. А. Міхайлавым, перабудаваны ў сярэдзіне 19 ст.) і 4 аднолькавымі будынкамі з бакоў (адзін з іх — сучасны Малы тэатр) і інш. Аўтар 1-й Градскай бальніцы (1827—32), Трыумфальных варотаў каля Цвярской заставы (1827—34, разабраны ў 30-я г. 20 ст., адноўлены ў 1968), цэркваў на Вялікай Ардынцы (1832—36) і ў Архангельскім пад Масквой (1822) і інш. Сярод жылых дамоў Б. найлепшы — асабняк Гагарына (1817, разбураны ў 1941 фаш. авіяцыяй), які вызначаўся дэкар. вытанчанасцю інтэр'еру.

Літ.: Хрипунов Ю. Д. Архитектура Большого театра, М., 1955; История русской архитектуры, 2 изд., М., 1956, с. 493—501; Покровская З. К. Архитектор О. И. Бове, М., 1964.

БАГАЛЕЙ Дзмітрый Іванавіч [26.10(7.11). 1857, Кіеў — 9.2.1932], украінскі савецкі гісторык, акад. АН УССР (1919). Аўтар прац па гісторыі Расіі, Украіны, Беларусі. Вывучаў гісторыю Вял. кн. Літ. і Рэчы Паспалітай, рус. і ўкр. гістарыяграфію. У манаграфіі «Гісторыя Северскай зямлі да паловы XIV ст.» прасачыў гісторыю ўсходнеславянскіх плямёнаў радзімічаў, вяцічаў, крывічоў, севяран з 9 ст. н. э.; іх паселішчы і гарады, грамадскі і сямейны быт, вераванні і абрады, гаспадарчыя, гандлёвыя і ваен. справы. У паслякастрычніцкі час вывучаў творчасць укр. філосафа 18 ст. Р. С. Скаварады, гісторыю руху дзекабрыстаў на Украіне.

Тв.: История Северской земли до половины XIV ст., Киев, 1882; К истории учений о быте древних славян, Киев, 1892; Русская история, т. 1—2 (ч. 1—2), М., 1909—14; Нарис української історіографії, т. 1 (в. 1—2), Київ, 1923—25; Декабристи на Україні, Харків, 1926.

БАГАЛЮБАВА, старажытнарускі горад (ціпер сяло) за 10 км ад Уладзіміра пры ўпадзенні Нерлі ў Клязьму. У 1158—65 паводле загаду кн. *Андрэя Багалюбскага* тут пабудаваны княскі замак — ансамбль белакаменных пабудоў, злучаных пераходамі. Б. ў 12 ст. найбольш важны (пасля Уладзіміра) паліт. цэнтр *Уладзіміра-Суздальскага княства*. Захаваліся лесвічная вежа палаца, т. зв. палата Багалюбскага, і перабудаваная царква. Раскопкі і рэканструкцыю замка зрабіў у 1934—54 М. М. *Варонін*. За 1,5 км ад Б. славутая ц. Пакрова на Нерлі (1165).

Літ.: Воронин Н. Н. Владимир. Боголюбово. Суздаль. Юрьев-Польской, 2 изд., М., 1965.

БАГАЛЮБАЎ Мікалай Мікалаевіч [н. 8(21).8.1909, Ніжні Ноўгарад], савецкі матэматык. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1947), акад. АН УССР з 1948. Ганаровы член шэрагу замежных акадэмій. Герой Сац. Працы (1969). З 1956 дырэктар лабараторыі тэарэт. фізікі Аб'яднанага ін-та ядзерных даследаванняў, з 1965 дырэктар гэтага ін-та. Асн. навук. працы прысвечаны прамым метадам варыяцыйнага вылічэння, тэорыі амаль перыядычных функцый, прыбліжаным рашэнням дыферэнцыяльных ураўненняў з граничнымі ўмовамі, нелінейнай механіцы і статыстычнай фізіцы, а таксама рэлятывісцкай квантавай тэорыі поля. Стварыў тэорыю звышцякучасці і звышправаднасці. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1952; Ленінская прэмія 1958. Дэп. Вярх. Савета СССР 7-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі.



Тв.: Избранные труды в 3-х т., т. 1, Киев, 1969.

Літ.: Николай Николаевич Боголюбов, М., 1959 (Материалы к биобиблиогр. ученых СССР).

БАГАМІЛЬСТВА, антыфеадальны сялянскі рух у Балгарыі ў 10—14 ст., які набыў форму рэлігійнай ерасі. Заснавальнікам і адным з галоўных прапаведнікаў ерасі, як мяркуюць, быў поп Багаміл. Умацаванне сувязей з балканскім поўднем спрыяла пранікненню Б. і на беларускія землі. Аднак у сацыяльна-эканам. умовах Беларусі яно не стала масавым рухам. Некат. палажэнні Б. (напр., пропаведзі непраціўлення) бел. ерэтыкі не прынялі. Пасля заваявання Балгарыі туркамі ў канцы 14 ст. Б. паступова знікае.

Літ.: Ангелов Д. Богомильство в Болгарии, пер. с болг., М., 1954.

БАГАМО́ЛАЎ Герасім Васілевіч [н. 4(17).3. 1905, в. Слізнёва Сычоўскага пав. Смаленскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне гідрагеалогіі і прыкладной геалогіі. Акад. АН БССР (1960), д-р геолага-мінералагічных н. (1940), праф. (1937). Чл. КПСС з 1930. Скончыў геолагаразвед. ф-т Маскоўскай горнай акадэміі ў 1929. З 1936 працуе ў геал. арг-цыях (дырэктар н.-д. ін-таў, нам. міністра геалогіі СССР, нам. акадэміка-сакратара аддз. геолага-геагр. навук АН БССР і інш.). З 1928 вывучае геалогію, гідрагеалогію і карысныя выкапні Беларусі і інш. раёнаў СССР. Удзельнічаў у выяўленні калійных соляў і нафты на Прыпяцкім Палессі. Распрацаваў метад хім. замацавання плывуноў. Чл. міжнар. арг-цый па даследаванні падземных водаў, чл.-кар. геал. т-ваў Францыі і Бельгіі. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1952. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Тв.: (разам з М. Вевіяроўскай) Гідрагеалагічныя даследы ў басейне ракі Свіслач, у зб.: Матэрыялы па вывучэнні геалогіі, гідрагеалогіі і карысных выкапняў БССР, т. 7, Мн., 1933; Характер напора подземных вод на территории БССР, у зб.: Геология и полезные ископаемые БССР. Сб. 2, Мн., 1948; (у сааўт.) Подземные воды центральной и западной частей Русской платформы (палеозой), Мн., 1962; (разам з А. І. Сілівым-Бекчурыным) Подземные воды и их изучение, Мн., 1966; Гидрогеология с основами инженерной геологии, 2 изд., М., 1966; (у сааўт.) Гидрогеология Волго-Уральской нефтегазоносной области, М., 1967.

БАГАМО́ЛАЎ Мікалай Цімафеевіч (н. 10.8. 1923, в. Аленьеўка Балашоўскага пав. Саратаўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. На фронце з чэрв. 1942, камандзір кулямётнага разліку. Вызначыўся ў баі пры фарсіраванні р. Друць каля Рагачова. 24.6.1944 кулямётны разлік адбіў 12 варожых контратак. Жыве ў с. Навасёлкі Рцішчаўскага р-на Саратаўскай вобл.

БАГАМО́ЛАЎ Пётр Іванавіч (н. ў ліст. 1903, г. Аткарск Саратаўскай губ.), удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1925. Скончыў Сярэднеазіяцкі ун-т (1931). З 1932 на парт. рабоце. У Чырв. Арміі з 1936. У Айч. вайну абараняў Рагачоў, Быхаў. У партызанах з 15.6.1942, камандзір узвода, нач. штаба атрада, нам. камандзіра, камандзір атрада, нач. штаба брыгады. З сак. 1944 камісар *партызанскай брыгады імя газеты «Правда»* Пухавіцкага р-на. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

БАГАМО́ЛАЎ Сяргей Аляксандравіч (н. 31.12.1923, в. Ратушына Кастрамскога пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1943. Вызначыўся ў баях каля в. Шарава пад Віцебскам 24.2.1944. Мінамётную батарэю, у якой служыў Б., вораг адрэзаў ад дывізіёна і атакаваў пры падтрымцы танкаў. Б. перавязваў параненых, выносіў іх з поля бою, хадзіў у разведку, адбіваў контратакі. 38 мінамётчыкаў адбілі пекалькі атак варожага батальёна. Удзельнік штурму Берліна. Жыве ў Маскве.

БАГАМО́ЛЕЦ Аляксандр Аляксандравіч [12(24).5.1881—19.7.1946], савецкі патафізіёлаг. Акад. АН СССР (1932), АН БССР (1933), АН УССР (1929), правадз. чл. АМН СССР (1944), ганаровы чл. АН Груз. ССР (1944), засл. дз. нав. УССР (1943). Герой Сац. Працы (1944). Н. ў Кіеве ў Лук'янаўскай турме (яго маці С. М. Багамолец была зняволена на 10 гадоў катаргі па справе *Пайдзіёварускага рабочага саюза*). Скончыў мед. ф-т Новарасійскага (Адэскага) ун-та (1906). З 1911 праф. кафедры агульнай паталогіі Саратаўскага ун-та. Пасля Кастр. рэв. актыўны грамадскі дзеяч: чл. камісіі па барацьбе з сыпным тыфам, кансультант у санітарных часцях Чырв. Арміі. У 1925—31 праф. кафедры паталагічнай фізіялогіі 2-га Маскоўскага ун-та. З 1931 узначальваў арганізаваныя ім Ін-т эксперымент. біялогіі і паталогіі і Ін-т клінічнай фізіялогіі АН УССР. Прэзідэнт АН УССР (з 1930), віцэ-прэзідэнт АН СССР (з 1942). Аўтар прац па эндакрыналогіі, патафізіялогіі, дзейнасці вегетатыўнай нервовай сістэмы, анкалогіі, перапланціраванні крыві, фізіялогіі і паталогіі злучальнай тканкі і праблемах даўгалецця. Асабліва значэнне маюць працы па вывучэнні ролі злучальнай тканкі. Б. прапанаваў спец. лекавую сываратку (АЦС). У малых дозах яна стымулюе дзейнасць злучальнай тканкі. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—2-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Избранные труды, т. 1—3, Киев, 1956—58.
Літ.: Спротинин Н. Н. Академик Александр Александрович Богомолец, Киев, 1957.

БАГАМО́ЛЫ (Mantoptera, Mantodea), атрад драпежных насякомых. Маюць 2 пары крылаў, але лятаюць дрэнна. Колерам і формай цела нагадваюць расліны. Жывуць у тропіках, у СССР — толькі на Пд. Вядома каля 2000 відаў, у СССР 20. Найчасцей трапляецца Б. звычайны (Mantis religiosa). Усе Б. дзённыя драпежныя насякомыя з няпоўным пераўтварэннем. Кормяцца пераважна насякомымі (тлёю, мухамі, саранчовымі, а трапічныя нават птушкамі). Калі чакаюць здабычу, сядзяць у характэрнай малітоўнай позе (адсюль назва).

Звычайны багамол.



БАГА́МСКІЯ АСТРАВЫ (Bahama Islands), архіпелаг у Атлантычным ак., калонія Вялікабрытаніі (з 1783) з унутраным самакіраваннем (з 1964). Усяго 702 а-вы, заселены 21. Галоўныя: Нью-Провідэнс, Вялікі Абака, Андрас, Вялікая Багама, Вялікі Інагуа. Пл. Б. а. 13,95 тыс. км². Насельніцтва 148 тыс. чал. (1968); каля 80% негры, астатнія амерыканцы і еўрапейцы. Адм. ц. і порт Насаў на в-ве Нью-Провідэнс.

Архіпелаг складзены з каралавых вапнякоў, найбольшая выш. да 60 м. Клімат трапічны, пасатны. На Б. а. вырошчваюць агаву, агародніну, цытрусавыя. Рыбалоўства, здабыча лангусты і губак. Лесараспрацоўкі. Турызм. Б. а. адкрыты Х. Калумбам у 1492. На некалькіх а-вах, арандаваных у 1940 на 99 гадоў, ваенныя базы ЗША.

БАГАМ'Я́ Сямён Данілавіч (1896, в. Бабровічы Ляскавіцкай вол. Бабруйскага пав.— 28.8.1922), удзельнік грамадзянскай вайны і барацьбы з бандытызмам па Беларусі. З сялян. У 1918—21 у Чырв. Арміі. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся на радзіму, быў выбраны старшынёй сельсавета. Арганізоўваў барацьбу мясцовага насельніцтва з бандай, якая забівала савецкіх і партыйных работнікаў, тэрарызавала нас. Загінуў у няроўнай бойцы з бандытамі, але знішчыў іх кіраўніка.

БАГАРА́Д Самуіл Нахманавіч [н. 4(17).8. 1907, Віцебск], Герой Савецкага Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Ленінградскі марскі тэхнікум (1935). У Айч. вайну камандзір падводнай лодкі Шч-310 Балтыйскага флоту. Вызначыўся ў баях за Прыбалтыку. Калі вораг быў блакіраваны сав. войскамі, гітлераўскае камандаванне спрабавала выратаваць свае часці марскім шляхам. Экіпажу Шч-310 была пастаўлена задача — не даць прайсці фаш. транспартам. Падводная лодка на чале з Б. за 2 паходы затапіла 7 варожых караблёў водаизмяшчэннем 40 тыс. *т*. Усяго экіпаж затапіў 10 караблёў праціўніка і транспарт. Капітан 1-га рангу Б. у адстаўцы, жыве ў Рызе.



БАГАРА́З Уладзімір Германавіч [15(27).4. 1865, мяст. Оўруч Валынскай губ.— 10.5.1936], савецкі этнограф, мовазнавец і пісьменнік. У 1890—98 за прыналежнасць да партыі «Народная воля» сасланы на Калыму. Вывучаў матэрыяльную культуру, быт, фальклор народаў Поўначы, пераважна чукчаў. З 1918 супрацоўнік Музея антрапалогіі і этнаграфіі АН СССР. З 1921 праф. Ленінградскага ун-та, з 1932 дырэктар Музея гісторыі рэлігіі і атэізму АН СССР. Адзін з ініцыятараў стварэння пісьменнасці народаў Поўначы, аўтар першых падручнікаў чукоцкай мовы. Выдаў манаграфію «Чукчы» (ч. 1—2, 1934—39). Пад псеўд. Н. А. Тан і В. Г. Тан пісаў вершы, апавяданні, раманы.

БАГАРО́ДЗІЦА (грэч. theotokos, theometer; лац. mater dei), міфічная багіня-маці; у хрысціянстве дзева Марыя, маці Ісуса Хрыста. Хрысціянскай Б. папярэднічалі егіпецкая Ісіда, вавілонская Іштар, фінікійская Астарта і інш., якія таксама лічыліся і багінямі ўрадлівасці. Царква афіцыйна прызнала дзеву Марыю багародзіцай на 3-м Усяленскім саборы (Эфес, 431).

БАГАРО́ДЗІЦКІ Васіль Аляксеевіч [6(18).4. 1857, мяст. Царовакакшайск Казанскай губ.— 23.12.1941], рускі савецкі мовазнавец. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1915), праф. Казанскага ун-та (1893). Вучань І. А. *Бадуэна дэ Куртэнэ*, прадстаўнік казанскай лінгвіст. школы. Працаваў у галіне агульнага, індаеўрап., слав. і цюркскага мовазнаўства. Займаўся эксперымент. фанетыкай, супастаўляльнай граматыкай. Напісаў «Нарысы па мовазнаўстве і рускай мове» (1901, 4 выд. 1939), «Агульны курс рускай граматыкі» (1904, 5 выд. 1935), «Уводзіны ў вывучэнне сучасных раманскіх і германскіх моў» (1953). У працах па рус. мове звяртаў увагу на некаторыя асаблівасці бел. мовы.

Літ.: Кузнецов П. С. Василий Алексеевич Богородицкий, «Труды Ин-та языкознания АН СССР», 1953, т. 2, (бібліягр. с. 256—270).

БАГАСЛО́ЎЕ, сістэматычны выклад і тлумачэнне ў навуковападобнай форме рэлігійных веравучэнняў. Б.— уласцівая ўсім пашыраным рэлігіям спроба сістэматызаваць рэліг. погляды, надаць ім выгляд тэорыі. Галоўны змест Б. выкладзены ў свяшчэнных кнігах (Біблія, Каран і інш.). Б. грунтуе свае вывады не на разумных доказах, а на веры ў рэліг. аўтарытэты, на сістэме раз і назаўсёды ўстаноўленых, нязменных догматаў.

Б. 20 ст. ўласціва імкненне ўлічваць пекат. дасягненні сацыяльных і прыродазнаўчых навук, якія, на думку тэолагаў, з'яўляюцца доказам мудрасці творца і дасканаласці яго творэнняў. Тэндэнцыю надаць Б. «навуковасць» высмеяў яшчэ Ф. Энгельс. У хрысціянстве адрозніваюць «богаадкрыццёвае» Б., якое нібыта заснавана на «боскім адкрыцці», і «натуральнае», якое павінна абгрунтоўваць рэліг. догматы дзякуючы стварэнню логіка-тэарэтычных сістэм. Б. складаецца з шэрагу галін: гістарычнае (гісторыя царквы, тэалогіі і інш.), сістэматычнае (дагматыка, апалагетыка і інш.) і практычнае (гамілетыка, або методыка пропаведзі, літургія, або методыка богаслужэння, катэхітыка, або методыка рэліг. адукацыі асоб, якія прымаюць хрысціянскую веру). Такая дыферэнцыяцыя і псеўданавуковыя назвы маюць на мэце паказаць Б. як «сапраўдную» навуку. У свеце штогод выдаецца вялікая колькасць літаратуры па Б. розных рэлігій. У СССР ёсць дзве духоўныя акадэміі (у Загорску і ў Ленінградзе), а таксама некалькі духоўных семінарый, дзе выкладаюць хрысціянскае Б.

Прагрэсіўныя мысліцелі крытыкавалі Б. Змястоўную і аргументаваную крытыку далі дзеячы эпохі Адраджэння, франц. асветнікі і матэрыялісты 18 ст., а таксама рус. рэвалюцыйныя дэмакраты. Паслядоўная навук. крытыка стала магчымай толькі дзякуючы ўзнікненню матэрыяліст. разумення гісторыі. Марксізм-ленінізм паказаў класавыя і гнасеа-

лагічныя вытокі рэлігійна-багаслоўнага тлумачэння свету, яго рэакц. сацыяльны сэнс.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954, с. 5—20; Габинский Г. А. Критика христианской апологетики, М., 1967.

Я. М. Бабосаў. Мінск.

БАГАСЛОЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч (13.3.1867—20.4.1929), рускі савецкі гісторык. Акад. АН СССР (1921). Скончыў Маскоўскі ун-т (1891). З 1898 прыват-дацэнт, з 1911 праф. Маскоўскага ун-та. Быў сакратаром Маскоўскага т-ва гісторыі і старажытнасцей расійскіх; старшынёй Рус. гістар. т-ва, пазней секцыі рус. гісторыі Ін-та гісторыі Расійскай асацыяцыі, н.-д. ін-таў грамада. навук. Даследаваў гісторыю Расіі 18 ст. У працах багаты фактычны матэрыял, але Б. пазбягаў абагульненняў і вывадаў.

Тв.: Смоленское шляхетство в XVIII в., «Журнал Министерства народного просвещения», 1899, март — апрель; Быт и нравы русского дворянства в первой половине XVIII в., 2 изд., П., 1918; Петр Великий и его реформа, М., 1920.

Літ.: Платонов С., Успенский Ф. и Никитский А. Записка об ученых трудах профессора Московского университета М. М. Богословского, «Известия Российской академии наук. Сер. 6», 1921, т. 15.

БАГАТА (Bogota), сталіца Рэспублікі Калумбія, цэнтр дэпартамента Кундынамарка. Знаходзіцца ў цэнтры краіны ў міжгорнай катлавіне і на схілах Усх. Кардыльеры на выш. 2660 *м* над узр. м. Вузел чыг. і шашэйных дарог, авіялініі. 2066 тыс. ж. (1967). Вялікі гандлёвы цэнтр краіны. Прадпрыемствы харч., тэкст., абутковай, швейнай прамысл. З-д швейных і пішучых машын, некалькі аўтазборачных з-даў. У ваколіцах здабыча каменнага вугалю і ізумрудаў; ГЭС, прадпрыемствы хім. прамысловасці. 10 ун-таў (найбольшы — Нацыянальны), акадэміі прыродазнаўчых навук, гісторыі, мовы, медыцыны, прыгожых мастацтваў, музеі.

БАГАТКЕВІЧ Аляксандр (1798—1831), бібліятэкар і бібліёграф. Скончыў Пастаўскую павятовую школу. У 1813 паступіў у Віленскі ун-т, сябраваў з А. Міцкевічам. З 1822 магістр філасофіі. Усё далейшае жыццё В. звязана з Віленскім ун-там. Быў бібліятэкарам, сакратаром адда. л-ры і мастацтва, пісаў і рэдагаваў навук. працы па лацінскай мове. У 1828 прызначаны ад'юнктам. З 1829 упершыню ва ун-це пачаў чытаць курс лекцый па агульнай бібліяграфіі.

БАГАТЫРОЎ Анатоль Васілевіч [н. 31.7 (13.8).1913, Віцебск], беларускі савецкі кампазітар, педагог і грамадскі дзеяч. Нар. арт. БССР (1968). Чл. КПСС з 1954. Скончыў Бел. кансерваторыю (1937, клас В. Залатарова). У 1938—49 старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР. У 1948—62 рэктар, з 1960 праф. Бел. кансерваторыі. Творчасці Б. характэрны шырокі дыяпазон вобразнага мыслення, схільнасць да ўвасаблення глыбока жыццёвых канцэпцый, меладычнасць, заснаваная на бел. нар. песеннасці. Узбагаціў многія жанры бел. музыкі. Першыя значныя творы: кантата «Сказ пра Мядзведзіху» (1937) і опера «У пушчах Палесся» (лібрэта Я. Рамановіча па аповесці Я. Коласа «Дрыгва», паст. 1939), за якую Б. атрымаў Дзярж. прэмію СССР 1941. Гераічнай барацьбе сав. народа супраць фаш. захопнікаў прысвечаны кантаты «Ленінградцы» (вершы Джамбула, 1942) і «Беларускім партызанам» (вершы Я. Купалы, 1943). Пасля вайны напісаў оперу «Надзея Дурава» (лібрэта І. Келера, 1946, паст. 1956), кантаты «Беларусь» (вершы Я. Купалы, П. Броўкі, П. Труса, 1949), «Леніну слава» (вершы Я. Коласа, 1952), «Беларускія песні» (1967, Дзярж. прэмія БССР 1969), 2 маналогі пра У. І. Леніна для баса і сімф. аркестра (1969), адначасова аддаваў шмат увагі сімф. жанру (2 сімфоніі, 1946 і 1947, Сюіта на тэмы бел. нар. песень, 1948, віяланчэльны і кантрабасавы канцэрты, 1962 і 1964, і інш.). Аўтар камерна-інстр. твораў буйной формы: фп. трыо (1943), санаты для скрыпкі (1946), віяланчэлі (1951), фп. (1958), трамбона (1964). Шмат зрабіў і ў сферы вак. музыкі — хоры, апрацоўкі нар. песень, цыклы рамансаў на вершы А. Пушкіна, М. Лермантава, У. Шэкспіра, Я. Купалы, М. Багдановіча, А. Куляшова. Аўтар музыкі да некалькіх фільмаў і тэатр. пастановак. Дэп. Вярх. Савета БССР 1—4-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі.



П. Броўкі, П. Трусам.

Літ.: Нисневич С. Опера «В пущах Полесья» А. Богатырева, у зб.: Белорусское искусство, Мн., 1957; Нисневич И. и Нисневич С. Очерки по истории советской белорусской музыкальной культуры, Л., 1969; Тикоцкий Е. Анатолий Васильевич Богатырев, «Советская музыка», 1963, № 10.

Т. А. Дубкова. Мінск.

«БАГАТЫРЫ», партыз. спец. група НКДБ СССР, якая ў Айч. вайну змагалася з акупантамі на тэрыторыі Капыльскага, Дзяржынскага, Слуцкага, Стаўбцоўскага, Лунінецкага і Баранавіцкага р-наў БССР. Перапраўлена ў варожы тыл у студз. 1944 (46 чал.). Група значна папоўнілася мясцовым насельніцтвам. Партызаны групы «Б.» правялі 63 баявыя аперацыі, пусцілі пад адхон 43 варожыя эшалоны, у т. л. бронецягнік; разбілі 47 паравозаў, 347 вагонаў і платформаў; знішчылі 9 аўтамашын, 2 танкі, мост; забілі і параніліі каля 2 тыс. варожых салдатаў. Партызаны збіралі і перадавалі сав. камандаванню звесткі пра размяшчэнне варожых аэрадромаў і гарнізонаў. 1—2.7.1944 група ў 100 чал. злучылася з часцямі Сав. Арміі. Камандзіру атрада А. М. *Шыхаву* прысвоена званне Героя Сав. Саюза.

Літ.: Люди легенд, в. 3, М., 1968, с. 547—555.

С. І. Барысаў, П. І. Емяльянаў. Мінск.


БАГАТЫРЭВІЧЫ, вёска ў Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Нёман. Цэнтр сельсавета. За 34 *км* на ПнЗ ад Мастоў, 38 *км* ад Гродна, 16 *км* ад чыг. ст. Чарлёна. 54 ж., двароў 19 (1970). Фельч.-ак. пункт, адда. сувязі. Легенду пра ўзнікненне Б. падала Э. Ажэшка ў рамане «Над Нёманам». Жыхары Б. удзельнічалі ў паўстаннях 1794 пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, 1863, у Айч. вайне 1812. У часы бурж. Польшчы нас. вёскі актыўна змагалася за сац. і нац. вызваленне.

БАГДАД, сталіца Ірака, цэнтр аднайменнай лівы (вобласці). Размешчаны на берагах Тыгра ў месцы яго збліжэння з Еўфратам. Гал. вузел чыг. і шашэйных дарог, найбольшы рачны порт краіны. Міжнар. аэрапорт, 1884 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1967).

В. васн. ў 762 халіфам Мансурам і стаў сталіцай *Абасідаў халіфата*. У 9 ст. Б.— найбуйнейшы для свайго часу цэнтр рамяства, транзітнага гандлю і арабскай культуры. У 10 ст. паступова страціў сваё паліт. значэнне. Няраз быў заваяваны і разбураны — перс. дынастыяй Буідаў (945), сельджукамі (1055), манголамі (1258), двойчы Цімурам (у канцы 14 і пач. 15 ст.). У 16 і 17 ст. ім уладалі папераменна Турцыя і Іран. З 1638 уваходзіў у склад Атаманскай імперыі. У 1917 заняты англ. войскамі, у 1920 адм. ц. брыт. падмандатнай тэрыторыі, з 1921 сталіца каралеўства Ірак.

Пасля 2-й сусв. вайны — цэнтр антыімперыялістычнага нац.-вызв. руху іракскага народа. У ліп. 1958 у выніку перамогі рэвалюцыі ў Б. абвешчана Іракская Рэспубліка. У Б. сканцэнтравана каля $^1/_3$ рабочых, занятых у прамысл. краіны. Гал. прадпр.: нафтаперапр. з-д, прадпр. металаапрацоўчай, цэментнай, тэкст., харч. прамысловасці. З дапамогай СССР пабудаваны: з-ды электратэхн. вырабаў, жалезабетонных шпалаў, швейная ф-ка, атамны рэактар, радыёстанцыя. Б.— цэнтр унутр. і знешняга гандлю збожжам, фінікамі, воўнай, скурамі. Зберагліся помнікі архітэктуры: палац Абасідаў з узорнай цаглянай муроўкай (12 ст.), васьмігранны маўзалей Зубайды з ячэістым купалам (пач. 13 ст.), гарадскія вароты Баб аль-Вастані (1221), караван-сарай хан Марджан (1359), маўзалей Мусы аль-Кадыма, ці Залатая мячэць (1515), і інш. Сучасны Б. цягнецца па 10—12 *км* па абодвух берагах Тыгра. У цэнтры плошча ат-Тахрыр з манументам Рэвалюцыі (1962, скульптар Джавад Салім), на праспекце Садун — помнік Невядомаму салдату (1959, арх. Р. аль-Чадэрчы), на поўдні — Універсітэцкі гарадок (арх. В. Гропіус і інш.). У Б.— Акадэмія навук, ун-т, Акадэмія прыгожых мастацтваў, гістар. музеі.

Багдад. Агульны выгляд горада.



БАГДАДСКІ ПАКТ, гл. *Арганізацыя цэнтральнага дагавору.*

БАГДАДСКІ ХАЛІФАТ, гл. *Абасідаў халіфат.*

БАГДАН ХМЯЛЬНІЦКІ, гл. *Хмяльніцкі* Зіновій Багдан Міхайлавіч.

БАГДАНАВА Надзея Канстанцінаўна (1836—97), руская балерына. Вучылася ў Маскоўскай балетнай школе. У 1851 займалася ў парыжскіх балетмайстраў і з поспехам дэбютавала на сцэне «Гранд-Апера». У 1855 вярнулася ў Расію, выконвала гал. партыі ў рамант. балетах. У 1864—67 гастраліравала ў Парыжы, Вене, Варшаве. Танец Б. вызначаўся адухоўленасцю, натхнёнасцю, тэхнічнай дасканаласцю. Адна з першых танцоўшчыц, якія сцвердзілі ў 19 ст. сусв. славу рус. балета.

БАГДАНАЎ, пасёлак у Валожынскім р-не Мінскай вобл., за 2 *км* ад р. Альшанка (прыток Бярэзіны). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Багданаўскі». За 30 *км* на ПнЗ ад Валожына, 106 *км* ад Мінска, на шашы Валожын — Ашмяны. 312 ж., двароў 81 (1970). Пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, дзіцячы сад-яслі, сталовая, 4 магазіны. Узнік Б. у 1905 як чыг. ст. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАГДАНАЎ (сапр. Малиноўскі) Аляксандр Аляксандравіч [10(22).8.1873—7.4.1928], рускі філосаф і эканаміст, палітычны дзеяч. Па прафесіі ўрач. Удзельнік рэвалюц. руху з 90-х г. 19 ст. У 1903 далучыўся да бальшавікоў. Пасля рэвалюцыі 1905—07 адышоў ад марксізма. У 1909 выключаны з радоў бальшавікоў як рэвізіяніст. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Пралеткульту*. З 1926 дырэктар Ін-та пераліванне крыві. Загінуў, праводзячы на сабе навуковы дослед. У філасофіі спрабаваў стварыць уласную сістэму — эмпірыяманіізм (разнавіднасць *махізму*). На месца матэрыялізм. дыялектыкі ставіў механістычную тэорыю «раўнавагі» паміж грамадствам і прыродай, адмаўляў класавую барацьбу як рухальную сілу грамадскага развіцця, замяняючы яе «арганізацыяй» прадукцыйных сіл. Суб'ект.-ідэаліст. погляды Б. раскрытыкаваў У. І. Ленін у працы «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм».

Літ.: Ленін У. І. Пісьмо слухачам школы на Капры, Тв., т. 16 (Полн. собр. соч., т. 47); Яго ж. Аб А. Багданаве, Тв., т. 20 (Полн. собр. соч., т. 24).

БАГДАНАЎ Анатоль Пятровіч [1(13).10.1834, Ніжнедзявіцкі пав. Варонежскай губ.— 16(28).3.1896], рускі антраполаг, заолаг, грамадскі дзеяч. Чл. Пецярбургскай АН (1890). Па яго ініцыятыве заснаваны Т-ва аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маск. ун-це (1864).

Т-ва акліматызацыі жывёл і раслін; арганізаваны этнаграфічная (1867), політэхнічная (1872) і антрапалагічная (1879) выстаўкі, на базе якіх заснаваны політэхнічны і антрапалагічны музеі. Першы ў гісторыі навукі адзначыў, што з цягам часу прыкметы антрапалагічных тыпаў чалавека зменьваюцца.

Літ.: Левин М. Г., А. П. Богданов и русская антропология (К 50-летию со дня смерти), «Советская этнография», 1946, № 1.

БАГДАНАЎ Рыгор Багданавіч [22.1(4.2).1910, в. Манцюшы Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.— 1.10.1943], Герой Савецкага Саюза (1943). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 25.8.1941. Удзельнік баёў на Смаленскім напрамку, Цэнтр. фронце. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на Пн ад Кіева ў кастр. 1943. Батальён ст. лейтэнанта Б., праследуючы ворага, з ходу фарсіраваў Дзясну і выйшаў на рубеж Дняпра, фарсіраваў раку, захапіў плацдарм, заняў 2 населеныя пункты і ўтрымліваў іх да падыходу гал. сіл. Б. загінуў у гэтым баі.



БАГДАНАЎ Іван Аляксандравіч (1897, в. Яблынаўка Тамбоўскай губ.— снеж. 1941), савецкі ваенны дзеяч. Чл. КПСС. З 1916 у арміі, вёў антываен. бальшавіцкую прапаганду. З 1918 чырвонагвардзеец. У складзе войск Надзвычайнай камісіі (ЧК) удзельнічаў у баях з белагвардзейцамі на Паўд. і Усх. франтах. За мужнасць і гераізм пры ліквідацыі антонаўскага мяцяжу ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе. З 1936 нач. аддзела Гал. ўпраўлення пагранічных і ўнутраных войск НКУС СССР, з 1939 нач. пагранічных войск НКУС БССР. За ўдзел у вызваленні Зах. Беларусі ўзнаг. ордэнам Чырв. Зоркі. У пач. Айч. вайны ўдзельнічаў у баях на зах. граніцы, выконваў спец. заданні ў акупаваным Мінску пад выглядам ням. генерала. Загінуў у баях за Маскву на пасадзе камандуючага 39-й арміі. Быў чл. ЦК КП(б)Б. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. За баявыя заслугі ў Айч. вайне ўзнаг. ордэнам Леніна.

БАГДАНАЎ Іван Васілевіч (н. 2.5.1924, пас. Первамайскі Палтарацкай вобл. Туркестанскай АССР), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Камандзір гарматы ст. сяржант Б. вызначыўся ў чэрв. 1944 у баях за в. Церашкова, Новы Двор, Ганчароўка Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. На шашы Бабруйск — Мінск разлік гарматы заспаніў ворагу шлях адступлення. Цяжка паранены Б. аставаўся ў страі да канца бою. Жыве ў Ашхабадзе.

БАГДАНАЎ Пётр Аляксеевіч (1882, Маскава — 1939), удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. Чл. КПСС з 1905. Вёў рэвалюц. работу ў Маскве, Варонежы. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 старшыня ваен. секцыі Гомельскага Савета і старшыня гарадской думы. У дні Кастр. рэвалюцыі старшыня Гомельскага рэўкома, потым чл. прэзідыума выканкома Савета. У 1921—23 старшыня ВСНГ РСФСР, пазней — на кіруючых дзярж. і гасп. пасадах. Быў чл. ВЦВК і ЦВК СССР.

БАГДАНАЎ Сямён Ільіч [30.8(11.9).1894, Пецярбург — 12.3.1960], савецкі ваенны дзеяч, удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945), маршал бранятанкавых войск (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1942. Удзельнік грамадз. вайны. У Айч. вайну дывізія, якою камандаваў Б., стрымлівала наступленне ням. фашыстаў на зах. граніцах Беларусі, неаднойчы контратакавала ворага пад Пружанамі Брэсцкай вобл. Удзельнік баёў на Курскай дузе, у Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Вісла-Одэрскай і Усх.-памеранскай аперацыях. Часці 2-й танкавай арміі, якою ў 1945 камандаваў ген.-палк. Б., першымі падышлі да Одэра, грамілі варожую абарону на подступах да Берліна, удзельнічалі ў акружэнні берлінскага гарнізона. З жн. 1947 нам. камандуючага, камандуючы бранятанкавых і механізаваных войск Сав. Арміі. У 1954—56 нач. Акадэміі бранятанкавых войск.

БАГДАНАЎ Юрый Станіслававіч (н. 8.12.1920, Вялікія Лукі, РСФСР), беларускі савецкі матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1967), праф. (1968). У 1964—68 заг. кафедры агульнай матэматыкі, з 1968 заг. кафедры вышэйшай матэматыкі і матэм. фізікі БДУ. Аўтар прац па якаснай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, па тэорыі функцый, функцыянальным аналізе і інш. раздзелах матэматыкі. Распрацаваў (1964—68) метад абагульненых характарыстычных лікаў, якім карыстаюцца, даследуючы ўстойлівасць і асімптатычныя паводзіны рашэнняў сістэм звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў.

Тв.: К теории систем линейных дифференциальных уравнений, «Доклады АН СССР», 1955, т. 104, № 6; Нормы Ляпунова в линейных пространствах, там жа, 1957, т. 113, № 2; (разам з М. П. Багданавай) Нелинейный аналог преобразования Ляпунова, «Дифференциальные уравнения», Мн., 1967, т. 3, № 5.

БАГДАНАЎ-БЕЛЬСКІ Мікалай Пятровіч (26.11.1868, в. Шыцікі Бельскага пав. Смаленскай губ.— 1945), рускі жывапісец. З беднай сялянскай сям'і. Акад. жывапісу (1903), праф. (1914). Член Т-ва перасоўных маст. выставак (1895—1918). Вучыўся ў нар. школе С. Рачынскага ў в. Тацева Смаленскай губ. (да 1883), якой прысвяціў нямала сваіх карцін («Вуснае лічэнне», 1895; «Проба галасоў», «У хворага настаўніка», «Каля дзвярэй школы», 1897), у іканапіснай майстэрні Троіцка-Сергіевай лаўры ў Загорску (з 1884), у Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства ў В. Паленава і У. Макоўскага. Атрымаў залаты медаль за работу «Будучы манах» (1889). Пісаў карціны на сюжэты з жыцця рус. і бел. сялян. Гал. героі яго твораў — дзеці. У 1911—17 выкладаў у Пецярбургскай акад. мастацтваў. Нейкі час жыў на Віцебшчыне, з 1921 — у Рызе. У Дзярж. маст. музеі БССР карціна Б.-Б. «Дзеці ў хаце» (1891).



М. П. Багданаў-Бельскі. Дзеці ў хаце. 1891. Дзяржаўны мастацкі музей БССР.

БАГДАНАЎКА, вёска ў Лунінскім с/с Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Гігант». За 30 *км* на ПнЗ ад Лунінца, 240 *км* ад Брэста, 18 *км* ад чыг. ст. Лоўча. 2352 ж., дварoў 503 (1970). Лясніцтва, філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны.

БАГДАНАЎСКАЕ, возера ў бас. р. Янкі, левага прытока Дзісны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,33 *км*². Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор (11,8 *км*²) раўнінны, азёрна-ледавіковы, забалочаны. Возера эўтрофнага тыпу, значна зарастае; на ПдЗ выцякае р. Янка. Водзяцца плотка, шчупак, лешч, акунь, лінь, мянтуз і інш.

БАГДАНАЎСКАЕ, возера ў бас. р. Крывінкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Сенненскім р-не Віцебскай вобл., на ПнЗ ад г. Сянно. Пл. 1,27 *км*². Даўж. 3,4 *км*, сярэдняя шыр. 0,4 *км*, найбольшая глыб. 14 *м*. Катлавіна выцягнута з ПдУ на ПнЗ. Берагі стромкія, выш. 12—15 *м*. Вадазбор (106 *км*²) дробнаўзгорысты і пакатахвалісты, марэнны, на Пд — нізінны. Возера эўтрофнага тыпу, значна зарастае. На ПдУ ўпадае пратока з воз. Сянно, на ПнЗ выцякае р. Крывінка. Водзяцца плотка, верхаводка, лешч, шчупак, акунь і інш.

БАГДАНОВІЧ Адам (Адольф) Ягоравіч (20.3.1862, м. Халопенічы Мінскай губ.— 16.4.1940), беларускі этнограф і фальклярыст, моваznавец, бацька М. *Багдановіча.* З сям'і былога прыгоннага. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1882), настаўнічаў у Ігуменскім пав. З 1885 заг. 1-га гар. пач. вучылішча ў Мінску. Удзельнічаў у рэвалюц. руху, адзін з кіраўнікоў мінскіх нарадавольцаў. Перайшоўшы на працу ў сялянскі зямельны банк у Гродне (1892), пачаў займацца навук. і літ. дзейнасцю. Змяшчаў артыкулы, рэцэнзіі, маст. творы і пераклады ў мясцовым друку і ў выданнях АН. Выдаў гістар. нарыс «Пра паншчыну» (1894), працу па этнаграфіі «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (1895). Зрабіў шмат запісаў бел. фальклору. Частка іх надрукавана ў «Матэрыялах для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» П. Шэйна. У 1896 пераехаў у Ніжні Ноўгарад, дзе пазнаёміўся і пасябраваў з М. Горкім, а ў 1907 — у Яраслаўль, дзе займаўся грамадскай, пед. і навук. дзейнасцю. Асн. праца Б. «Мова зямлі. Утварэнне водарачных імёнаў і што ад іх паходзяць» (т. 1—2) — даследаванне рачных і азёрных назваў Еўропы, Азіі і Паўн. Афрыкі. На яе тэарэт. аснове ў 30-я г. напісаў «Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх» (т. 1—2), «Этнічны склад беларускага народа» (асталіся ў рукапісах), «Мова зямлі. Насельніцтва Верхняга Паволжа, Акі і Камы» (апубл. ў 1966, Яраслаўль). Аўтар прац «Рэвалюцыйны рух у г. Мінску і губерні ў 80 і пачатку 90-х гг.», «Да гісторыі партыі «Народнай волі» ў Мінску і Беларусі, 1880—1892 г.», успамінаў пра М. Горкага і Ф. Шаляпіна, сына Максіма, пра жыццё бел. сялянства («Мае ўспаміны», т. 1—2). Рукапісы Б. ў Ін-це л-ры АН БССР.



Тв.: Страницы из жизни Максима Горького..., Мн., 1965.

Літ.: Пширков Ю. С., А. Е. Богданович, Мн., 1966. *Ю. С. Пшыркоў.* Мінск.

БАГДАНОВІЧ Анатоль Васілевіч [16(28).8.1888, мяст. Слабада-Дзісна Дрысенскага пав. Віцебскай губ.— 2.8.1969], беларускі савецкі мова- і літ.-знавец. Канд. філал. н., дац. БДУ (1926). Чл. КПСС з 1956. Скончыў Варшаўскі ун-т (1913). Настаўнічаў, выкладаў бел. мову ў БДУ. Удзельнічаў у распрацоўцы бел. арфаграфіі. Працаваў у Інбелкульце, потым (1927—29) у Ін-це мовы і л-ры АН БССР, з 1934 у пед. ін-тах РСФСР і УССР. Аўтар падручніка «Беларуская мова» (1927), сааўтар «Граматыкі рускай мовы» (ч. 2, 1938) для адыгейскіх школ.



Тв.: Новая беларуская літаратура, Віцебск, 1925.


БАГДАНОВІЧ Віктар Францавіч [н. 16(29).2.1904, мяст. Жыткавічы Мазырскага пав. Мінскай губ.], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. (1949). З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1926. З 1918

працаваў на чыгунцы, на заводах у Жыткавічах. У Чырв. Арміі з 1922. Скончыў Гомельскія пях. камандныя курсы (1923), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1943). З 1938 нач. штаба, нам. камандзіра дывізіі. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны (1939—40). У Айч. вайну на Паўн.-Зах., Волхаўскім, Ленінградскім, Сцяпным, Паўд.-Зах. і 3-м Укр. франтах. З крас. 1944 нам. камандуючага войск Паўд.-Уральскай, потым Туркестанскай ваен. акруг. У 1956—61 у апараце Мін-ва абароны. Узнаг. ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

БАГДАНОВІЧ Леанід Іванавіч (н. 18.2.1923, г. Мінск), беларускі савецкі дэрмата-венеролаг. Д-р мед. н., праф. (1960). Чл. КПСС з 1943. У 1949 скончыў Віцебскі мед. ін-т. У 1949—51 ардынатар, 1951—54 асістэнт кафедры скурных і венерычных хвароб Віцебскага мед. ін-та, з 1958 заг. гэтай кафедры. Асн. працы па ультрагукавой тэрапіі хвароб скуры. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 2-й ступені і медалямі.

Тв.: Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967.

БАГДАНОВІЧ Максім Адамавіч [27.11(9.12). 1891, Мінск — 12(25).5.1917], выдатны беларускі паэт, перакладчык, літаратуразнавец, празаік. Вучыўся ў Ніжагародскай (1902—08), скончыў Яраслаўскую гімназію (1911) і Яраслаўскі Дэмідаўскі юрыд. ліцэй (1916). Працаваў сакратаром у Мінскім губ. харчовым камітэце (кастр. 1916 — люты 1917). Памёр ад сухотаў у Ялце, там і пахаваны. Першы друкаваны твор — апавяд. «Музыка» («Наша ніва», 1907, № 24). Адзіны прыжыццёвы зб. вершаў «Вянок» (Вільня, 1913). Паэзія Б. народжана рэв. 1905 і развівалася ва ўмовах рэакцыі, у атмасферы вострых сацыяльна-паліт. канфліктаў і нарастання новых рэвалюц. сіл. Асн. паліт. накіраванасць творчасці Б. — патрыят. служэнне сацыяльнаму і нац. вызваленню бел. народа, сцвярджэнне інтэрнац. ідэй роўнасці і братэрства, барацьба за гуманіст. ідэалы. Пачынаў Б. з непрыняцця тагачаснай рэчаіснасці, уціску чалавека-працаўніка, проціпастаўляючы ім агульначалавечыя духоўныя пачаткі прыгожага і добрага (вобразы мадоннаў у «Вянку»). Ад пазагістар., абстрактна-гуманіст. ідэалаў дэмакратызм паэта эвалюцыяніраваў да сцвярджэння рэвалюц. ідэй гераічнага, самаахвярнага змагання за інтарэсы народа. У паэзіі Б. моцна гучалі ідэі нацыянальна-вызваленчай барацьбы супраць царскай імперыі як турмы народаў, супраць вялікадзярж. шавінізму. Б.-масштак асн. сваёй задачай лічыў узбагачэнне роднай л-ры новымі тэмамі і формамі. Яго вершы — шматгранны паказ жыцця чалавека ў





Вокладкі кніг М. Багдановіча: «Вянок» (Вільня. 1913). «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык» (Мінск. 1947).

разнастайных сувязях з грамадствам і прыродай. Галоўнае ў іх — жыццялюбства («Прывет табе, жыццё на волі!», «Вышаў з хаты»), актыўнае стаўленне да рэчаіснасці («Рушымся, брацця, хутчэй», «Кінь вечны плач свой аб старонцы!»), захапленне красой жыцця («Пад белым пухам вішняў», «Зімой»), маладосцю («Маладыя гады»), мудрасцю, працавітасцю, таленавітасцю народа («Летапісец», «Слуцкія ткачыхі»). Але ў абставінах тагачаснай рэчаіснасці на першы план вылучаліся тэма падняволынага жыцця прац. народу, роднага краю («Краю мой родны! Як выкляты богам», «Народ, Беларускі Народ!», «Беларусь, твой народ дачакаецца»), вобраз селяніна-працаўніка («Гнусь, працую, пакуль не парвецца», «Пан і мужык»), грамадзянскі сум («Мяжы», «Ой, чаму я стаў паэтам», «Вы, панове, пазіраеце далёка»). Матывы смутку паглыбляліся асабістай драмай паэта, з васемнаццаці гадоў хворага на сухоты. У Б.-лірыка моцная схільнасць да роздуму, развагі. Адсюль філас. паглыбленасць яго вершаў («Зразаюць галіны таполі адну за адной», «Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя», «Жывеш не вечна, чалавек», санет «На цёмнай гладзі сонных луж балота», рандо «Узор прыгожы пекных зор», «Перад паводкай»). Ён з Я. Купалам заснавальнікі пейзажнай і інтымнай любоўнай лірыкі ў бел. паэзіі («Я, бальны, бесскрыдлаты паэт», трыялет «Мне доўгае расстанне з Вамі», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы»). Вялікая заслуга паэта ў распрацоўцы гістар. тэмы («Летапісец», «Безнадзейнасць», «Песня пра князя Ізяслава Полацкага») і урбаністычных матываў («Вулкі Вільні віюць і гулка грымяць», «На глухіх вулках — ноч глухая»). Шырока развіваў у бел. лірыцы т. зв. вечныя тэмы жыцця, смерці, кахання, дружбы (пізка «Каханне і смерць», рандэль «На могілках», трыялет «С. Палуяну»). Творчасць Б. мела першаступеннае значэнне ў гістар. самапазнанні народа і сцвярджэнні яго месца ў гісторыі чалавецтва. Яго вершы вызначаюцца майстэрскім выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў класічнай і песенна-нар. паэтыкі. Выхаваны на паэзіі А. Пушкіна, А. Фета, Ф. Цютчава, добра знаёмы з сучаснай

яму рус. паэзіяй, узбагаціў родную л-ру перадавымі ідэямі і багатым эстэтычным вопытам. Зб. «Вянок» стаў у бел. паэзіі ўзорам творчага засваення класічнай паэтыкі на нац. глебе. Школай высокага майстэрства з'яўляюцца змешчаныя тут санеты, трыялеты, рандо, актавы, тэрцыны, пентаметры. Класічную культуру пёс роднаму слову Б. і як перакладчык Гарацыя, Авідзія, Ф. Шылера, Г. Гейнэ, А. Ф. Арвера, П. Верлена, Э. Верхарна, Ю. Святагора, Пушкіна, А. Майкава, М. Розенгейма, А. Крымскага, А. Алеся. Перакладаў таксама на рус. мову творы Я. Купалы, Т. Шаўчэнкі, І. Франка, В. Стафаніка, У. Самійленкі. Вялікае месца ў творчасці Б. займаў фальклор: спачатку выкарыстанне бел. міфалогіі («Чуеш гул? — Гэта сумны, маркотны лясун», «Вадзянік», «Змяіны цар»), потым вобразаў, матываў, рытміка-інтанац. складу бел. нар. песні («Не кувай ты, шэрая вязюля», пізка «На сінім Дунаі»). Вершы т. зв. беларускага складу — узор лірыкі, стылізаванай пад бел. песенна-нар. паэтыку («Бяседная», «Лявоніха», «Скірпуся»). Паэмы Б. былі пошукам нац. эпасу: гераічнага — «Максім і Магдалена», сацыяльна-бытавога — «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Пісаў Б. у класічных і песенна-нар. формах іншых паэзій (песні «Руская», «Украінская», «Сербская», «Скандынаўская», «Іспанскія», у форме рубаі — «Персідскія», у форме танкі — «Японскія»). Праца Б.-крытыка накіравана на абарону рэалізму і народнасці — эстэт. асноў перадавой бел. л-ры нач. 20 ст. («Глыбы і слаі», 1911; «За тры гады», 1913; «Забыты шлях», 1915). Адзін з заснавальнікаў навук. гісторыі бел. л-ры («Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI стагоддзя», «Новы перыяд у гісторыі беларускай літаратуры»). Лепшыя апавяданні Б. стаяць каля вытокаў бел. нац. прозы («Апокрыф», 1913; «Апавяданне аб іконніку і залатару...», 1914). Даследаваў л-ру і гісторыю братніх слав. народаў (артыкулы пра Шаўчэнку, М. Ламаносава, Пушкіна, М. Лермантава, гістор.-этнагр. нарысы «Украінскае казацтва», «Галіцкая Русь», «Угорская Русь», «Браты-чэхі» і інш.). Яго публіцыстыка звязана з супрацоўніцтвам (1913—16) у яраслаўскай газ. «Голос». Прозу, літаратуразнаўчыя і публіцыст. артыкулы часткова пісаў на рус. і ўкр. мовах. У сав. час паэзія Б. стала здабыткам шырокіх нар. мас. Яна ўплывае на развіццё бел. паэзіі і сёння, асабліва сваім глыбокім пранікненнем у духоўны свет чалавека і высокай культурай паэтычнага слова. Частка вершаў перайшла ў нар. песні («Зорка Венера», «Слуцкія ткачыхі»), многія пакладзены на музыку кампазітарамі А. Тураковым, М. Аладавым, А. Багатыровым, Л. Абелёвічам, Э. Тырманд. Творы Б. перакладзены на многія мовы народаў СССР і за мяжой. Імем паэта названы вуліцы, школы, б-кі. У Мінску на дамах, дзе нарадзіўся і жыў Б., устаноўлены мемарыяльныя дошкі. На тэр. санаторыя «Беларусь» (15 *км* ад Ялты) у 1957 пастаўлены помнік.

Тв.: Творы, т. 1—2, Мн., 1927—28; Творы, Мн., 1957; Збор твораў, т. 1—2, Мн., 1968; Маладзік, Мн., 1968.

Літ.: Майхровіч С. Максім Багдановіч, Мн., 1958; Грынчык М. Максім Багдановіч і народная паэзія, Мн., 1963; Богдановичъ А. Е. Материалы к биографии Максима Богдановича, у яго кн.: Страницы из жизни Максима Горького..., Мн., 1965; Лойка А. Максім Багдановіч, Мн., 1966; Стральцоў М. Загадка Багдановіча, Мн., 1969; Клышка А. Цвяток радзімы васілька, у яго кн.: Права на верш, Мн., 1967; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969; Замоцін І., М. А. Багдановіч. Крытыка-біягр. нарыс, «Узвышша», 1927, № 2, 3, 5; Валасовіч-Гравнова Г. Успаміны пра брата, «Полымя», 1966, № 10; Годнеў П. Браты Багдановічы, «Маладосць», 1966, № 12; Бярозкін Р. Па законах красы, «Полымя», 1969, № 4; Бачыла А. Скарбы куфра Багдановічаў, «Маладосць», 1969, № 6; Ватацы Н. В. (скл.). Максім Багдановіч Бібліягр. даведнік, Мн., 1961; Rich V. Maksim Bahdanovic in Byelorussian literature. «The Journal of Byelorussian studies», London, 1965, v. 1, № 1, p. 36—50.

А. А. Лойка. Мінск.

БАГДАНЧУК Сяргей Яфімавіч (парт. псеўд. Жэнька; 1911, в. Касцяні Чамяроўскай вол. Слонімскага пав. Гродзенскай губ. — 4.4.1933), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПЗБ з 1928. Ствараў падпольныя камсамольскія арг-цыі на Слонімшчыне. У 1927 выбраны сакратаром Слонімскага падпольнага акруговага к-та КСМЗБ. За ўдзел у рэвалюц. і нац.-вызв. руху польскія ўлады няраз арыштоўвалі Б. У адпаведнасці з рашэннем ЦК КПЗБ накіраваны ў СССР. Скончыў камвуз у Маскве і ў чэрв. 1932 вярнуўся ў Зах. Беларусь. З ліп. 1932 сакратар Брэсцкага падпольнага акруговага к-та КПЗБ. Схоплены паліцыяй і закатаваны ў в. Радванічы Брэсцкага пав.



С. Р. Анісаў. Мінск.

БАГДАШ Халед (Халід; н. 15.11.1912, Дамаск), дзеяч сірыйскага рабочага руху. З 1930 чл. Сірыйскай камуніст. партыі, з 1933 сакратар ЦК, з 1937 ген. сакратар. Неаднойчы арыштоўваўся калан. і мясцовымі ўладамі. У 1954—58 дэпутат сірыйскага парламента. Узначальваў дэлегацыі кампартыі на XIX, XX, XXI, XXII і XXIII з'ездах КПСС, на Маскоўскіх нарадах прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый 1957, 1960, 1969 і на ўрачыстым святкаванні 50-годдзя Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. ў Маскве. Аўтар многіх прац па пытаннях нац.-вызв. барацьбы араб. народаў, перакладаў (1933) на араб. мову «Маніфест Камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса.



БАГДАШЭВІЧ Іван (г. н. і см. невяд.), арганізатар і кіраўнік аднаго з найбольш буйных на Беларусі ўзброеных паўстанняў мяшчан Давыд-Гарадка, мяст. Гарадзец і сялян навакольных вёсак у час вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54. Быў войтам Давыд-Гарадка. У час паўстання выбраны палкоўнікам войска, якое складалася з некалькіх тысяч чалавек. Паўстанцы пад кіраўніцтвам Б. больш за 2 гады кантралявалі ўсю тэр. Давыд-Гарадоцкай вол. Гл. *Давыд-Гарадоцкае паўстанне 1648—50.*

Літ.: Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в., Мн., 1966, с. 49.

БАГЕРНАЯ ПОМПА (ад гал. bagger грязь), адноступеньчатая цэнтрабежная помпа для перамяшчэння вадкасці з цвёрдымі часцінкамі. Адрозніваецца ад помпаў, якія напампоўваюць аднародную вадкасць, большым сячэннем каналаў; адводны патрубак мае форму кольца са значнай адлегласцю паміж пачаткам адводу і вонкавай акружнасцю рабочага кола. Карыстаюцца для гідрапопелавыдалення, перапампоўвання пульпы. На Беларусі Б. п. выпускае *Бабруйскі машынабудаўнічы завод.*

БАГНА (твань, дрыгва), зыбкае, гразкае балота. Пад покрывам з петрыбалай травяна-імшыстай дзярніны знаходзіцца слой вады або разрэджанага ілу. Узровень вады блізкі да паверхні, перыядычна мяняецца. Утвараецца Б. на месцах вадаёмаў у працэсе іх зарастання. Гл. таксама *Балоты.*

БАГНОЎКА (Empetrum), род шматгадовых вечназялёных кусцікаў сямейства вадзянікавых. Сцябло сцелецца па зямлі, даўж. да 1 *м*. Лісце дробнае, вузкаэліптычнае. Кветкі ружовыя або цёмна-чырвоныя. Плод — шарападобная шыза-чорная ягада. Вядома 9 відаў, пашыраных у краінах Паўн. і Паўд. паўшар'яў; у СССР усе 9 (у тундравай і лясной зонах), у БССР адзін від — Б. чорная (E. nigrum); расце на балотах, у вільготных лясах. Ягады ядомыя, кіславатыя з пурпуровым сокам, маюць вітамін С, фарбавальныя і дубільныя рэчывы. Настой з травы Б. ўжываецца ў нар. медыцыне.



Багноўка чорная.

БАГРАМЯН Іван Хрыстафаравіч (н. 2.12.1897, г. Елізаветполь), савецкі ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1955). Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1941. У арміі з вер. 1915. Удзельнік грамадз. вайны. У 1934 скончыў Акадэмію імя Фрунзе, у 1938 Акадэмію Ген. штаба. У пачатку Айч. вайны пач. аператыўнага аддзела, нам. нач. штаба Кіеўскай асобай ваен. акругі; з вясны 1942 нач. штаба Паўд.-Зах. фронту. З ліп. 1942 камандуючы 16-й (11-й гвардзейскай) арміі Зах. фронту, якая ўдзельнічала ў разгроме паўн. фланга арлоўскай групоўкі праціўніка ў Курскай бітве 1943. З ліст. 1943 камандуючы 1-га Прыбалтыйскага фронту. Войскі гэтага фронту правялі *Гарадоцкую аперацыю 1943*, у ходзе якой акружылі і знішчылі варожую групоўку і стварылі спрыяльныя ўмовы для далейшага наступлення Сав. Арміі. У час *Беларускай аперацыі 1944* войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Бел. франтоў акружылі і знішчылі віцебскую групоўку ворага, фарсіравалі Зах. Дзвіну, вызвалілі Віцебск (гл. *Віцебска-Аршанская аперацыя 1944*). Войскі 1-га Прыбалт. фронту вызвалілі Полацк, Лепель, Дзісну, Ушачы, Глыбокае, Паставы, Браслаў, Панявежыс, Даўгаўпілс (Дзвінск), Шаўляй, Елгаву (Мітаву) і інш. З лют. 1945 Б. нам. камандуючага 3-га Бел. фронту. Удзельнічаў у арганізацыі і правядзенні Рыжскай, Усх.-прускай і інш. аперацый. У пасляваенныя гады камандуючы войск Прыбалтыйскай ваен. акругі. У 1954—58 у апараце Мін-ва абароны СССР: гал. інспектар, нам. міністра, потым нач. Выш. ваен. акадэміі Ген. штаба. З 1958 нам. міністра абароны, нач. тылу Узбр. Сіл СССР. На XIX і XX з'ездах КПСС выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XXII і XXIII — чл. ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—8-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкая Рэвалюцыя, многімі інш. ордэнамі і медалямі СССР і замежных краін.



БАГРАНА Элісавета (сапр. Белчава; н. 29.4.1893, Сафія), балгарская паэтэса. Нар. дз. культ. НРБ (1963), Герой Сац. Працы (1967). З сям'і чыноўніка. Скончыла Сафійскі ун-т (1915). Друкуецца з 1915. У першым зб. «Вечная і святая» (1927) сцвярджае балг. жанчыну як раўнапраўнага члена грамадства. У зб. «Зорка марака» (1932) і «Сэрца чалавечае» (1936) пакутны роздум над сац. кантрастамі бурж. рэчаіснасці. У 2-ю сусв. вайну пісала антыфаш. творы. Буд-ва сацыялізма, барацьба за мір, дружба з СССР — асн. тэмы зб. «Пяць зорак» (1953). Узмацненне інтымнага пачатку, паглыбленае асэнсаванне грамадскіх праблем у зб. «Ад берага да берага» (1963). Паэзія Б. ярка эмацыянальная і паўнагучная. Піша і для дзяцей. Дзімітроўская прэмія (1950).

Тв.: Избрани произведения, София, 1968; бел. пер.— у зб.: Ад стром балканскіх, Мн., 1965; рус. пер.— Сердце человеческое, М., 1959.

БАГРАТЫДЫ (Багратуні), старажытны княскі род у Арменіі. Вядомы з 1 ст. да н. э. У 1—5 ст. н. э. Б. займалі важныя пасады пры царскім двары Аршакідаў. У 4 ст. іх родавым уладаннем была вобласць Кагавіт.

У 8—9 ст. Б. заўладалі большай ч. Арменіі, набылі пасаду «князя князёў» і ўзначальвалі барацьбу супраць арабскіх заваёўнікаў. У 886 Ашот І Б. стаў армянскім царом; з 961 сталіца — г. Ані, ад якога царства названа Анійскім. Найбольшага росквіту дынастыя Б. дасягнула ў 2-й пал. 10 — пач. 11 ст. У 1045 Арменію захапіла Візантыя, і дынастыя Б. перастала існаваць.

БАГРАТЫЁНІ, дынастыя, якая царавала ў Грузіі з 9 да 19 ст.

У 1-й пал. 9 ст. картлійскі князь Ашот Б. стварыў княства Тао-Кларджэты, якое стала паліт. і культ. цэнтрам Грузіі. У 10 ст. Баграту III (975—1014) удалося аб'яднаць груз. землі. Найбольш выдатныя прадстаўнікі Б.: Давід IV Будаўнік (1089—1125), Георгій III (1156—84), Тамара (1184—1213). Яны пашырылі паліт. ўплыў на усё Закаўказье, Паўн. Каўказ і паўн.-усх. ўзбярэжжа Чорнага м. У 13 ст. Б. плацілі даніну манголам. З канца 15 ст. пасля распаду адзінай груз. дзяржавы Б. правілі ў Картлійскім, Кахецінскім, Імерэцінскім царствах. У 1762 Усх. Грузія (Картлі і Кахеты) пад уладай Б. аб'ядналася ў адну дзяржаву. У 1801 Грузія была далучана да Расіі, і царская ўлада Б. скончылася. Адна з чатырох галін роду Б. была запісана ў расійскі княскі род. З роду Б. выйшлі многія вядомыя дзеячы, у т. л. рускі палкаводзец П. І. *Багратыён.*

«БАГРАЦІЁН», кодавая назва стратэгічнай наступальнай аперацыі Савецкай Арміі па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вял. Айч. вайны. Гл. *Беларуская аперацыя 1944.*

БАГРАЦІЁН Пётр Іванавіч (1765, г. Кізляр Церскай вобл.— 12.9.1812), рускі палкаводзец, герой *Айчыннай вайны 1812.* Вучань і паплечнік А. В. Суворава і М. І. Кутузава. Нашчадак грузінскай царскай дынастыі *Багратыёні.* Ваен. службу пачаў у 1782 сяржантам Каўказскага мушкецёрскага палка. Удзельнічаў у Каўказскіх войнах 1783—86, у асадзе Ачакава (1788), у задушэнні паўстання Т. Касцюшкі і штурме Варшавы (1794). Вызначыўся ў італьян. і швейц. паходах Суворава (1799), у пераходзе цераз Альпы. У кампаніі 1805—07 пад в. Шэнграбен (Аўстрыя) з 6-тысячным атрадам стрымаў 30-тысячнае войска французаў. Удзельнік рус.-шведскай вайны 1808—09, рус.-турэцкай 1806—12. З сак. 1812 камандаваў 2-й Зах. арміяй, якая размяшчалася па тэр. Беларусі паміж Нёманам і Бугам; штаб-кватэра арміі знаходзілася ў Ваўкавыску. У пач. Айчыннай вайны 1812 вывеў сваю армію ад Нёманскага прыгранічча ў напрамку Слонім — Навагрудак — Нясвіж — Слуцк — Бабруйск — Магілёў да Смаленска на злучэнне з 1-й Зах. арміяй Барклая дэ Толі. У баях на тэр. Беларусі каля Воранаў, Закрэўшчыны, Гудзявіч, Вішнева, Карэліч, Міра (27—28 чэрв.), Раманава (2 ліп.) і Салтанаўкі (11 ліп.) армія Б. прычыніла значныя страты праціўніку. Б.



бліскучымі манеўрамі двойчы выратоўваў армію ад разгрому: адступаючы ад Навагрудка ў напрамку Мінска, 2-я Зах. армія ледзь не трапіла ў клешчы войск маршала Л. Даву, але Б. хутка павярнуў яе на Нясвіж; пасля бітвы пад Салтанаўкай ён пакінуў для прыкрыцця корпус ген. М. М. Раеўскага і непрыкметна для ворага 13 ліп. пераправіў армію цераз Дняпро каля Нова-Быхава. У *Барадзінскай бітве 1812* камандаваў левым крылом рус. арміі. Быў цяжка паранены і памёр у в. Сімы Уладзімірскай губ. У 1839 прах перанесены на Барадзінскае поле. Цікавыя матэрыялы пра дзейнасць Б., асабліва па тэр. Беларусі, ёсць у *Ваўкавыскім ваенна-гістарычным музеі* імя П. І. Баграціёна.

Літ.: Генерал Багратион. Сб. документов и материалов, [М.], 1945; Документы штаба М. И. Кутузова. 1805—1806. Сб., Вильнюс, 1951; Полосин И. И., П. И. Багратион (Жизнь и деятельность), М., 1948; Ростунов И. И. Петр Иванович Багратион. Очерк полководческой деятельности, М., 1957; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года, Мн., 1962; Жилин П. А. Гибель наполеоновской армии в России, М., 1968.

БАГРЫМ Паўлюк Восіпавіч (1813, мяст. Крошын Навагрудскага пав. Мінскай губ.— каля 1891), беларускі сялянскі паэт. З сям'і каваля. Вучыўся ў Крошынскай парафіяльнай школе. За распаўсюджванне антыпрыгонніцкіх вершаў і ўдзел у сялянскім бунце (1828) здадзены ў рэкруты. Вярнуўшыся, працаваў у Крошыне кавалём. Быў здольны майстар. У Крошынскім касцёле зберагаецца металічная люстра, выкаваная Б.,— цікавы ўзор металічнай коўкі 19 ст. на Беларусі. Арнамент люстры — спалучэнне кветкавых матываў (бутоны) і жаўрукоў у палёце. Захаваўся адзіны верш Б. «Зайграй, зайграй, хлопча малы», які кранае сілай пратэсту супраць прыгоннага ладу, глыбінёй і непасрэднасцю пачуццяў.

Паўлюк Багрым. Скульптурны партрэт работы З. І. Азгура. 1964.

Літ.: Александровіч С. Незабыўнымі сцежкамі, 2 выд., Мн., 1962, с. 3—17; яго ж. Па слядах паэтычнай легенды, Мн., 1965, с. 167—174; Бас І. Літаратурныя пошукі, знаходкі, даследаванні, Мн., 1969, с. 61—76; Янулайціс А. Аб маладым паэце з Крошына, «Маладая Беларусь», 1913, сш. 3; [Jackowski I.]. Powieść z czasu mojego, czyli Przygody litewskie, Londyn, 1854.

А. І. Мальдзіс. Мінск.

БАГРЫМАВІЧЫ, вёска ў Пніцкім с/с Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл., на р. Прыпяць. За 25 *км* на У ад Петрыкава, 160 *км* ад Гомеля, 5 *км* ад чыг. ст. Пніч. 668 ж., двароў 186 (1970). Сплаўны ўчастак. Васьмігадовая школа, б-ка, мед. пункт, 2 магазіны. У Вял. Айч. вайну фашысты спалілі 119 дамоў і інш. будынкаў, загінула 58 ж. Абеліск 200 сав. воінам, якія загінулі пры вызваленні Петрыкаўскага р-на ад ням.-фаш. захопнікаў.

БАГРЫЦКІ (сапр. Дзюбін) Эдуард Георгіевіч [22.10(3.11).1895, Адэса — 16.2.1934], рускі савецкі паэт. З мяшчанскай яўр. сям'і. Першыя вершы — стылізаваныя, умоўна рамантычныя — надрукаваны ў 1915—16. У грамада. вайну быў інструктарам палітаддзела партыз. атрада, пісаў агітвершы, лістоўкі, адозвы. Пазней ва ўкр. аддз. РОСТА. У лірычных вершах і паэмах таго часу стварыў рамант. вобразы свабодалюбных людзей («Тыль Уленшпігель», «Птушкалоў», «Карчма»). З 1925 жыў у Маскве. Спачатку ўваходзіў у групу «Перавал», потым далучыўся да канструктывістаў. У гады нэпа ў паэзіі Б. загучалі матывы разгубленасці і песімізму. Паэма «Дума пра Апанаса» (1926, асобн. выд. 1932, оперная лібрэта 1933) — адзін з лепшых твораў сав. паэзіі пра грамада. вайну. У 1928 выйшаў першы зб. «Паўднёвы захад», у 1932 — «Пераможцы». У іх Б. ўслаўляе мужнасць і рэвалюц. ўздым сав. народа. Паэтычная трылогія «Апошняя ноч», «Чалавек прадмесця» і «Смерць піянеркі» (1932) раскрывае гібель філасофіі і маралі старога ўласніцкага свету, душэўную веліч і харство новага чалавека, выхаванага рэвалюцыяй і сацыялізмам. Паэтычны стыль Б. вызначаецца «фламандскай» яркасцю фарбаў, эмацыянальнай узнёсласцю і смеласцю метафарычнага мыслення. Перакладаў паэтаў народаў СССР, у т. л. Я. Купалу («Дзве таполі», «Снег», «Паяджане», «Крым»). Некаторыя творы Б. («Смерць піянеркі», «Дума пра Апанаса» і інш.) перакл. на бел. мову М. Багун, С. Дзяргай, М. Хведаровіч.



Тв.: Стихотворения и поэмы, М.—Л., 1964.
Літ.: Любарева Е. Эдуард Багрицкий. Жизнь и творчество, М., 1964; Рождественская И. Поэзия Эдуарда Багрицкого, Л., 1967.

Р. С. Вярозкін. Мінск.

БАГУДЗЕНКА, вёска ў Ятранскім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 24 *км* на Пд ад Навагрудка, 205 *км* ад Гродна, 20 *км* ад чыг. ст. Наваельня. 225 ж., двароў 70 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, б-ка, Дом жывёлавода, фельч.-ак. пункт, магазін. Будуецца (1970) клуб.

БАГУН (Ledum), род вечназялёных кустоў сямейства верасовых. Выш. 10—130 *см*. Лісце скурыстае, лінейна-падоўжанае. Кветкі белыя, духмяныя. Суквецце — парасонападобны шчыток. Вядома 8 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і. У СССР 4, у БССР адзін — Б. балотны (L. palustre, нар. назвы: багно, бахун, бор, клапоўнік). Утварае зараснікі на вярховых балотах. Ядавіты, мае ў сабе гліказід арбуцін, дубільныя рэчывы, эфірны алей з рэзкім пахам. Настой з травы ўжываецца ў медыцыне як адхарквальны сродак. Лісце — сродак ад молі і клапоў.



Багун балотны.

БАГУН Іван (г. н. невяд. — 17.2.1664), украінскі вайсковы дзеяч, віленскі і брацлаўскі палкоўнік, наказны гетман (1651), паплечнік Б. Хмяльніцкага у *вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*. Праславіўся перамогамі над польскімі войскамі на Брацлаўшчыне (1648), пад Віленцай (1651), Жванцам (1653), Уманню (1654). Напярэдадні Белацаркоўскага дагавору 1651 заняў Белую Царкву і навакольныя вёскі, гэтым спрыяў Хмяльніцкаму пры абмеркаванні ўмоў дагавору. У 1659 узначаліў паўстанне супраць укр. гетмана І. Выгоўскага, які перайшоў на бок польскай шляхты. У 1664 арыштаваны польскім урадам і расстраляны ў Ноўгарадзе-Северскім. У 1918 адзін з палкоў дывізіі М. А. Шчорса быў названы імем Б.

БАГУН Міхась (Блошкін Міхаіл Фёдаравіч; 8.11.1908, Мінск — снеж. 1937), беларускі савецкі пісьменнік. З сям'і паштовага службоўца. Рана страціўшы бацьку, служыў парабкам у кулакоў. Скончыў курсы пры Мінскім пед. тэхнікуме (1928), пастаўпічаў (1929—30). Удзельнічаў у калектывізацыі вёскі. У 1930 працаваў на дарожным буд-ве, з 1931 у газ. «Чырвоная Полаччына». У 1932—36 рэд. Дзярж. выд. БССР, супрацоўнік газ. «Літаратура і мастацтва». Друкавацца пачаў у 1926 у газ. «Беларуская вёска». Выдаў зб. вершаў «Рэха бур» (1931) і «Рэвалюцыі» (1932), апавяданне для дзяцей «Жэнька» (1934). Паэма «Канчыта з-пад Таледа» (1936) — пра барацьбу ісп. рэспубліканцаў супраць фаш. мяцежнікаў. Напісаў апавяд. «Сярод белых драпежнікаў» (1929), «Вораг у доме» (1932), «Жывыя чэрці» (1933). Перакладаў творы А. Пушкіна, У. Маякоўскага, Ф. Панфёрава, М. Астроўскага («Як гартавалася сталь»), Э. Багрыцкага, Л. Первамайскага, Я. Гашака.

Тв.: Выбранае, Мн., 1961.
Літ.: Звонак А. Шляхам ясным і простым. «Полымя», 1968, № 11; Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць, Мн., 1968, с. 169—174.

БАГУСЛАЎСКІ (Bogusławski) Войцех (9.4.1757, маёнтак Глінна каля Познані — 23.7.1829), польскі рэжысёр, акцёр драмы і оперы (бас), драматург, педагог, тэатральны дзеяч. Заснавальнік прафесіян. нац. драм. і муз. т-ра. Творчую дзейнасць пачаў у 1778. У 1783, 1790—94, 1799—1814 дырэктар Нац. т-ра (Варшава). Заснаваў у Варшаве ў 1811 першую драм. школу. Аўтар лібрэта і пастаноўшчык першай нац. оперы «Выдуманы цуд, ці Кракаўцы і горцы» Я. Стэфані (1794), якая да гэтага часу ставіцца ў польск. т-рах. З ролей: Бардас («Кракаўцы і горцы»), Лір («Кароль Лір» Шэкспіра). Шмат гастраліраваў з тэатр. трупамі, у т. л. ў Гродне (1784, 1787).

Літ.: Krawczykowski Z., Dąbrowski S. i Straus S. Wojciech Bogusławski, Warszawa, 1954; Hübner Z. Bogusławski — człowiek teatru, Warszawa, 1958.

БАГУСЛАЎСКІ Уладзімір Рыгоравіч [н. 9(22).9.1914, в. Пліса Невельскага пав. Віцебскай губ.], Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1939. У чэрв. 1944 байцы батальёна на чале з капітанам Б. прарваліся ў тыл ворага, фарсіравалі Зах. Дзвіну каля в. Узрэчча Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., захапілі плацдарм на зах. беразе, вызвалілі 15 нас. пунктаў, адбілі 3 варожыя контратакі і з ходу фарсіравалі р. Улу. Жыве ў Варашылаўградзе.



БАГУЦІЧЫ, вёска ў Ельскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 8 *км* на Пд ад Ельска, 186 *км* ад Гомеля, 3 *км* ад чыг. ст. Багуцічы. 822 ж., двароў 268 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны, швейная майстэрня. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАГУЦКІ Вацлаў Антонавіч (парт. псеўд. Вацэк, Шпак, Аляксандр; 1884, мяст. Буракова каля Варшавы — 19.12.1937), польскі рэвалюцыянер, савецкі партыйны дзеяч. У 1904 уступіў у с.-д. партыю Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). За рэвалюц. дзейнасць 9 разоў быў арыштаваны, 4 гады сядзеў у турмах. У 1910 эмігрыраваў у ЗША, там з польскіх рабочых стварыў секцыі СДКПіЛ. Вярнуўся ў Расію ў 1912, удзельнічаў у 1-й сусв. вайне. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі чл. выканкома Тыфліскага Савета. У 1918 кіраўнік к-та СДКПіЛ, стваральнік арг-цый Камуніст. рабочай партыі Польшчы (КПРП) у Беластоку і Гродне, старшыня Гродзенскага к-та партыі. З 26 студз. да 27.4.1919 узначальваў Гродзенскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У 1919—20 старшыня Надзвычайнай камісіі ў Мінску, чл. ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі, адначасова з мая 1919 чл. Бюро ЦК КП(б)ЛіБ па нелегальнай рабоце. У 1921 займаўся аднаўленнем парт. арг-цый на акупаванай тэр. Зах. Беларусі і Віленшчыны. У 1922—24 сакратар Цэнтральнага Бюро КП(б)Б і нам. старшыні СНК БССР, чл. прэзідыума і нам. сакратара Часовага Бел. Бюро ЦК РКП(б). З 1924 да 1926 прадстаўнік ЦК Кампартыі Польшчы ў Выканкоме Камінтэрна, чл. Выканкома і канд. у чл. яго прэзідыума. У 1927—28 на курсах марксізма ў Маскве. З 1929 на прафс. рабоце: старшыня ЦК прафсаюза работнікаў сувязі, старшыня Скандынаўскай секцыі Выканкома Прафінтэрна. На I Усесаюзным з'ездзе Саветаў (1922) выбраны чл. ЦВК, у 1924 чл. Прэзідыума ЦВК. Чл. ЦК КПП (1925—30). *Л. П. Нартыш-Блук.* Мінск.



БАГУШЫ, вёска ў Лядскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 20 *км* на ПнЗ ад Шчучына, 52 *км* ад Гродна, 27 *км* ад чыг. ст. Ражанка. 164 ж., двароў 44 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

БАГУШЭВА, вёска ў Нацкім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл., на берагах азёраў Арэхаўна і Крукаўскае. Цэнтр калгаса «Маладая гвардыя». За 32 *км* на ПдЗ ад Полацка, 132 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Ветрына. 159 ж., двароў 62 (1970). Пач. школа, клуб.

БАГУШЭВІЧ Іван Міхайлавіч [12(25).9.1906, Мінск — 14.8.1962], Герой Савецкага Саюза (1943). Працаваў на будаўніцтве, настаўнічаў. З 1935 у Чырв. Арміі. Удзельнік баёў з японцамі на р. Халхін-Гол (1939). На франтах Айч. вайны з чэрв. 1942: ваяваў пад Сталінградам, на Курскай дузе, удзельнічаў у вызваленні Румыніі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі. Вызначыўся ў баях пры фарсіраванні Дняпра каля Днепрадзяржынска. Полк, якім камандаваў Б., адзін з першых пераправіўся цераз раку, зламаў супраціўленне ворага і распачаў наступленне. Б.— ганаровы грамадзянін г. Браціслава.



БАГУШЭВІЧ Марыя Уладзіміраўна (парт. псеўд. Рэгіна, Ванда, Вяжеда; 4.1.1865, в. Цеперка Слуцкага пав. Мінскай губ.— 1887), дзячка рэвалюцыйнага руху ў Польшчы. Са збяднелай дваранскай сям'і з роду Касцюшкаў. Скончыўшы пансіянат (1883), настаўнічала. Распаўсюджвала сярод рабочых і інтэлігенцыі марксісцкую л-ру, вяла рэвалюц. прапаганду. Увосень 1884 узначаліла ЦК *«Пралетарыяту»*. Аднавіла разгромленыя парт. арг-цыі ў Лодзі, Згежы і Тамашуве-Мазавецкім. Працягвала выдаваць цэнтр. орган партыі — газ. «Пралетарыят», адозвы. 30.9.1885 арыштавана (разам з братам). У 1887 саслана ў Сібір. Памерла ў краснаярскай турме.


Тв.: Pamiętnik, Wrocław, 1955.
Літ.: Baumgarten L. Dzieje Wielkiego Proletariatu, Warszawa, 1966; Kółka socjalistyczne, gminy i Wielki Proletariat. Procesy polityczne 1878—1888. Zebr., oprac. i wstęp L. Baumgartena, Warszawa, 1966.

С. А. Малевіч. Мінск.

БАГУШЭВІЧ Францішак Казіміравіч [9(21).3.1840, фальварак Свіраны Віленскага пав.—



15(28).4.1900], беларускі паэт-дэмакрат, пачынальнік крытычнага рэалізму ў бел. л-ры. З сям'і збяднелага шляхціца. У 1861 скончыў Віленскую губ. гімназію і паступіў на фізматэм. ф-т Пецярбургскага ун-та, адтуль за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях выключаны. Вярнуўшыся на радзіму, настаўнічаў у Допішках Лідскага пав. Удзельнічаў у паўстанні 1863, быў паранены. Пасля паўстання, каб пазбегнуць рэпрэсій, пераехаў на Украіну. У 1868 скончыў Нежынскі юрыд. ліцэй. Служыў судовым следчым у розных гарадах Украіны (з 1874 каля 10 гадоў у Канатопе) і Расіі. Пераехаўшы ў Вільню (1884), працаваў адвакатам у акруговым судзе. У 1898 з-за стану здароўя пакінуў



Дом Ф. Багушэвіча ў Кушлянах.

службу і перабраўся ў Кушляны. Пісаў вершы і апавяданні, складаў слоўнік бел. мовы. Памёр у Кушлянах, пахаваны ў Жупранах.

Творчасць Б. прыпадае пераважна на 80—90-я г. 19 ст. Пісаць пачаў пад уплывам паэзіі Т. Шаўчэнкі. Многія творы не пабачылі свету: кн. «Беларускія апавяданні Бурачка» царская цэнзура не прапусціла ў друк; не ўдалося пакуль што адшукаць і зб. вершаў «Скрыпачка беларуская». З дапамогай польскіх сяброў, асабліва Я. Карловіча, выдаў у Кракаве зб. «Дудка беларуская» (1891, пад псеўд. Мацей Бурачок) і апавяданне «Тралялёначка» (1892), у Познані — зб. «Смык беларускі» (1894, пад псеўд. Сымон Рэўка з-пад Барысава). 1885—91 друкаваўся ў польскім час. «Kraj» («Край»), што выдаваўся ў Пецярбурзе. Светапогляд, грамадскія і эстэт. перакананні паэта склаліся ў 60-я г. пад уздзеяннем сялянскага руху і ідэй рус. рэвалюц. дэмакратаў (М. Чарнышэўскага, М. Някрасава). Паэт сацыяльнай тэмы. Рэалістычна малюе карціны жахлівага становішча сялян («Дурны мужык, як варона», «Праўда»); гнеўна выкрывае бурж.-памешчыцкі лад, прыгнёт, дэспатызм самаўладства і панаўючых класаў («Бог не роўна дзеле»). Вострая непрымірымасць да сац. несправядлівасці вынікала з глыбокага разумення Б. класавага антаганізму прыгнечаных і эксплуататараў («Быў у чысці», «Кепска будзе!»). Паэт-дэмакрат узняўся да ўсведамлення нац. значэння агульнадэмакр. барацьбы супраць рэшткаў феадалізму, за ачышчэнне ўсяго ўкладу бел. жыцця ад пражыткаў прыгоннага рабства, якія затрымлівалі сац. і культурны прагрэс краіны («Гарцуй, танцуй, пане», «Калыханка»). Праўдзіва, са шчырай сімпатыяй паказвае Б. працоўнае сялянства («Як праўды шукаюць», «У судзе», «Хрэсьбіны Мацюка», «Думка»), абуджэнне яго самасвядомасці, выспяванне грамадска-паліт. актыўнасці («Скаціная апека»). Аўтар абароне правы і інтарэсы сялян. Уся яго творчасць накіравана на ўзвышэнне простых людзей, паэтызацыю духоўных магчымасцей і рэвалюц. здольнасцей народа («Чаго бяжыш, мужычок?», «У астрозе», «Не цурайся» і інш.). Прысвяціў пранікнёныя вершы радзіме («Хмаркі», «Ахвяра»), адзін з першых бел. пісьменнікаў выступіў у абарону роднай мовы і л-ры. Рознабаковы талент Б. аднолькава ярка выявіўся ў лірыцы, публіцыстыцы, прозе. Вершы Б.— паэзія жывога, дасціпнага, гутаркова-сялянскага слова, народнапесеннай вобразнасці, інтанацыі, паэтыкі. У літ. дзейнасці апіраўся на лепшыя традыцыі вуснай нар. творчасці, рус., укр. і польскай л-р. Паэзія Б. зрабіла прыкметны ўплыў на развіццё бел. л-ры, на творчасць А. Гурыновіча, Цёткі, Я. Купалы і інш.

Народ шануе памяць Б.: створаны *Ашмянскі краязнаўчы музей* імя Ф. Багушэвіча, у Жупранах яму пастаўлены помнік (1958), у Кушлянах, дзе жыў паэт у дзяцінстве і юнацтве і пасля пераезду з Вільні, захаваны дом Б., у якім знаходзяцца сельская б-ка яго імя, дакументы і матэрыялы пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Тв.: Выбраныя творы, Мн., 1952; Творы. [Прадмова С. Александровіча]. Мн., 1967.

Літ.: Барысенка В. В. Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя, Мн., 1957; Майхровіч С. К. Жизнь и творчество Ф. Богушевича. Мн., 1961; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага, Мн., 1963, с. 255—302; Яго ж. З думай пра Беларусь. Мн., 1966, с. 233—317; Александровіч С. Незабыўнымі сцежкамі, 2 выд., Мн., 1962, с. 44—70; Яго ж. На слядах паэтычнай легенды, Мн., 1965, с. 135—146; Яго ж. Гісторыя і сучаснасць, Мн., 1968, с. 139—164; Стральцоў М. Жыццё ў слове, Мн., 1965, с. 5—13; Навуменка І. Я. Пісьменнікі-дэмакраты, Мн., 1967, с. 71—108; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969.

В. В. Барысенка. Мінск.

БАГУШЭВІЧЫ, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., на р. Уса (прыток Бярэзіны). Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоная Беларусь». За 24 *км* на ПдЗ ад г. Бераэіно, 95 *км* ад Мінска, 30 *км* ад чыг. ст. Градзянка. 374 ж., двароў 121 (1970). Лясніцтва, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, вет. ўчастак, адда. сувязі, 2 магазіны. Паблізу Б. у атрадзе паўстанцаў (1863) змагаўся беларускі




Галава каменнай статуэткі з гарадзішча Багушэвічы.

рэвалюцыянер-дэмакрат А. Д. *Трусаў*. Адсюль выйшаў паўстанцкі камісар Мінскай губ. Б. Ч. *Свентаржэцкі*. У цэнтры вёскі помнік на магіле аднаго з першых камсамольцаў раёна М. В. Рыбачонка, якога забілі кулакі ў 1924. Помнік-абеліск на месцы пахавання сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну. На левым беразе ракі гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур (4 ст. да н. э.— 2 ст. н. э.). Раскопкі праводзіліся Л. Д. Побалем у 1964—65. Сярод выяўленых рэчаў найбольш каштоўныя — галава каменнай статуэткі і бронзавае скроневае кольца. Стараж. насельніцтва гарадзішча мела сувязі з плямёнамі культуры штрыхаванай керамікі. Рэчы зберагаюцца ў Мінскім абл. краязнаўчым музеі (г. Маладзечна).

Літ.: Побаль Л. Знаходка ў Багушэвічах, «Маладосць», 1966, № 5. *Л. Д. Побаль.* Мінск.

БАГУШЭЎСК, гарадскі пасёлак (з 1938) у Сенненскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Багушэўскі». За 38 *км* на У ад Сянна, 42 *км* ад Віцебска. Чыг. ст. (Багушэўская)



Бальніца па вуліцы Калгаснай у Багушэўску.

на лініі Віцебск — Орша. Вузел шашэйных дарог на Сянно, Віцебск, Оршу. 4,6 тыс. ж. (1969). Мэблевая ф-ка, лясгас, лясніцтва, раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка», цэх Сенненскага харчкамбіната, маслазавод, лесапункт Аршанскага леспрамгаса, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. 2 сярэднія і дзіцячая аздараўленчая школы, дзіцячы сад і яслі, Дом культуры, 2 б-кі, 2 бальніцы. У Вял. Айч. вайну каля Б. дзейнічала партыз. брыгада на чале з К. С. Заслонавым. Помнік У. І. Леніну, 3 помнікі сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. У Б. ўстаноўлена мемарыяльная сцяна і дошка байцам і камандзірам 20-й гвардз. арміі, якія вялі тут баі ў ліп. 1941.

БАДАЕЎ Аляксей Ягоравіч [4(16).2.1883—3.11.1951], дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Чл. КПСС з 1904. Чл. *бальшавіцкай фракцыі 4-й Дзяржаўнай думы* (з 1912), Пецярбургскага к-та і Рускага Бюро ЦК РСДРП, супрацоўнік «Правды». Удзельнік Кракаўскай і Парыжскай парад ЦК РСДРП з парт. работнікамі. Меў сувязь з бальшавікамі Беларусі. У 1912—13 праўдзівецкая група Магілёва інфармавала Б. пра становішча на прадпрыемствах горада, па яго даручэнні вяла паліт. работу вакол анкеты думскай бальшавіцкай фракцыі. У 1913 Б. двойчы прыязджаў у Гомель правяраць дзейнасць і памагаць Палескаму к-ту РСДРП у наладжванні рэвалюц. работы. Увосень 1914 арыштаваны і сасланы ў Сібір. У крас. 1917 як прадстаўнік ЦК РСДРП(б) удзельнічаў у рабоце 1-га з'езду ваен. і рабочых дэпутатаў армій і тылу Зах. фронту ў Мінску. Ад Віцебскай выбарчай акругі вылучаны канд. ва Устаноўчы сход па спісе бальшавікоў (кастр. 1917). У гады Сав. улады — старшыня Цэнтрасаюза, нам. старшыні Массавета (з 1930), Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета РСФСР, нам. старшыні Прэзідыума Вярх. Савета СССР (1938—43). На XIV—XVIII з'ездах ВКП(б) выбраны чл. ЦК. Напісаў кнігу «Бальшавікі ў Дзяржаўнай думе. Успаміны» (1929).


БАДАНАЎ Генадзь Пятровіч [н. 16(29).11.1911, в. Тубапаеўка Васільскага пав. Ніжагародскай губ.], беларускі і рускі савецкі архітэктар. У 1940 скончыў Маскоўскі архіт-ра. Удзельнічаў у аднаўленні разбуранага ў 1941—44 Мінска. Адзін з аўтараў праекта забудовы цэнтр. часткі Ленінскага праспекта (Дзярж. прэмія БССР 1968). Сярод работ: Цэнтральная пл. (з У. Каралём, Л. Мацкевічам, М. Асмалоўскім, М. Парушнікавым), 106, 108 і 124-кватэрныя дамы (1948—54), мост цераз Свіслач (1951—53), гасцініца «Мінск» (1956—58, усе на Ленінскім праспекце ў Мінску); жылыя, у т. л. 25-павярховыя, дамы ў Маскве.

БАДЗЮЛ Іван Іванавіч [н. 21.12.1917 (3.1.1918), с. Аляксандраўка Херсонскай губ.], партыйны і дзяржаўны дзеяч, першы сакратар ЦК КП Малдавіі (з 1961). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Вазнясенскі с.-г. тэхнікум (1937), Маскоўскую ваен. акадэмію (1942), ВПШ пры ЦК КПСС (1958). Удзельнік Айч. вайны. З 1946 на адказных пасадах у Савеце Міністраў Малд. ССР; з 1948 у апараце прадстаўніка Савета па справах калгасаў пры ўрадзе СССР па Малд. ССР; з 1951 на парт. рабоце, з крас. 1959 другі сакратар, з мая 1961 першы сакратар ЦК КП



Малдавіі. На XXII і XXIII з'ездах КПСС выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

БАДЗЯГА (Spongillidae), сямейства прэснаводных губак. Даўж. да 1 *м*. Форма разнастайная. Шкілет крамянёвы. Колер жоўты, зеленаваты або чырванаваты. Водзіцца ў прэсных вадаёмах Еўропы і Азіі. Вядома 7 родаў. Размнажаецца полавым і бясполым спосабамі. Характэрна вялікая здольнасць Б. да ўзнаўлення: нават з самага дробнага кавалачка не вырастае самастойная асобіна. Каланіяльныя Б. часта аблепліваюць падводныя прадметы. Шкодзяць гідратэхнічным збудаванням. Высушаныя Б.— нар. сродак ад рэўматычных і інш. боляў. Ужываецца ў медыцыне ў выглядзе мазяў.



БАДЗЯЖНІЦТВА, стале перамяшчэнне з месца на месца асоб, якія не займаюцца вытворчай працай; сацыяльная з'ява, уласцівая эксплуататарскаму, пераважна бурж., ладу.

Пашырылася ў перыяд разлажэння феад. ладу ў выніку абеззямельвання сялян, якіх не магла поўнасцю паглынуць мануфактурная прамысловасць і якія ператварыліся ў жабракоў, разбойнікаў, бадзяг. У бурж. краінах прычынай Б. з'яўляецца эксплуатацыя чалавека чалавекам, крыніцы і хранічнае беспрацоўе. У Вялікабрытаніі, ЗША і інш. імперыялісц. краінах да абазначаных у Б. ужываюцца суровыя меры пакарання. У царскай Расіі, паводле Уложэння аб пакараннях 1845, асоб, якія жабравалі і валацужнічалі, саслалі ў аддаленыя вёскі. У СССР Б. як сацыяльнай з'явы няма, часам сустракаецца як перажытак мінулага, калі некат. людзі імкнуцца жыць за кошт грамадства. Сав. заканадаўства ў пэўных выпадках разглядае Б. як злачынства (арт. 204 КК БССР). Паводле Канстытуцыі СССР і канстытуцый саюзных рэспублік права з'яўляецца справай гонару. Кожны грамадзянін абавязаны працаваць паводле прынцыпу «хто не працуе, той не есць». У СССР дзярж. органы ажыццяўляюць *працаўладкаванне* грамадзян, у БССР Дзярж. к-т па выкарыстанні працоўных рэсурсаў. Непрацаздольным асобам адпаведна з законам прызначаецца пенсія.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 726—734. *А. А. Примачонак.* Мінск.

БАДЗЯКА Міхаіл Мікалаевіч [н. 17(30).8.1914, в. Пячары Магілёўскай губ.], беларускі вучоны ў галіне металазнаўства і тэрмічнай апрацоўкі металаў. Д-р тэхн. н. (1968), праф. (1968). Чл. КПСС з 1948. Заг. лабараторыі тэрмакінетыкі структурных ператварэнняў у металах і сплавах Фіз.-тэхн. ін-та АН БССР. Навук. працы ў галіне тэарэт. і тэхналаг. асноў рэкрышталізацыйных працэсаў пры хуткім бесперапынным нагрэве (індукцыйным, кантактавым і інш.).

Тв.: (разам з С. А. Астапчыкам і Г. Б. Ярашэвічам) Термокинетика рекристаллизации, Мн., 1968.

БАДЗЯНСКІ Восіп Максімавіч [31.10(12.11).1808, мяст. Варва Лохвіцкага пав. Палтаўскай губ.— 6(18).9.1877], украінскі філолаг-славіст, гісторык і пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1834). З 1842 праф. кафедры слав. л-р Маскоўскага ун-та. Сакратар Маскоўскага т-ва гісторыі і старажытнасцей расійскіх (з 1845), рэд. «Чтений Московского общества истории и древностей российских» (1846—48; 1858—77). Аўтар прац: «Пра погляды адносна паходжання Русі» (1835), «Пра народную паэзію славянскіх плямёнаў» (1837), «Пра час узнікнення славянскага пісьма» (1855) і інш. Пісаў вершы (зб. «Нашы ўкраінскія казкі», 1835). Перакладаў на рус. мову працы П. *Шафарыка*. Збіраў бел. народныя песні, даследаваў мову «Біблii» Ф. Скарыны, беларускую паэму «Энеіда навыварат».

Літ.: Кондратов Н. А. Осип Максимович Бодянский. М., 1956.

БАДЛЕР (Baudelaire) Шарль (17.4.1821, Парыж — 31.8.1867), французскі паэт. Выступіў у друку ў сярэдзіне 40-х г. (брашуры «Салон 1845», «Салон 1846»). У час рэвалюцыі 1848 выдаваў дэмакр.-рэсп. газету «Le salut public» («Грамадскі ратунак»), змагаўся на барыкадах. Здрадніцтва буржуазіі, устанаўленне дыктатуры Напалеона III абумовілі трагічны характар паэзіі Б. У 1857 выйшаў яго зб. «Кветкі зла», у 1860 — кн. «Ненатуральны рай», у 1869 — «Вершы ў прозе». У многіх творах Б. спачуваў абяздоленым, услаўляў бунт супраць прыгнёту і несправядлівасці, выкрываў роліг. крывадушнасць. Урбаністычныя вершы паказваюць кантрасты галечы і багацця капіталіст. горада, яго злачынстваў і заганы. Творчасць Б. супярэчлівая: ненавісцячы пошласць бурж. мяшчанскай маралі, ён абвясціў свабоду ад усялякай маралі; праклінаючы згубныя сілы зла, адначасова паэтызаваў іх. Упадніцкія рысы яго паэзіі падхапілі дэкадэнты. На бел. мову творы Б. перакладалі Ю. Гаўрук (у яго кн.: «Кветкі з чужых палёў», 1928; у час. «Маладняк», 1926, № 5), У. Жылка (у час. «Узвышша», 1927, № 3), С. Ліхадзіеўскі (у яго кн.: «Берасцянка жывых трывог», 1962), на рус. мову — П. Якубовіч, В. Левік, П. Антакольскі.

Тв.: Рус. пер.— Лирика, М., 1965.

БАДМІНТОН, спартыўная гульня з ракеткай і валанам. Назву атрымала ад англ. гарадка Бадмінтан. У Б. гуляюць на пляцоўцы (*м*) 13,4×5,2 (для адзіночных) ці (*м*) 13,4×6,1 (для парных сустрэч) праз сетку памерам (*м*) 6,10×0,75, нацягнутую на выш. 155 *см*. Ракетка лягчэйшая за тэнісную і больш эластычная. Валан — маленькі мячык з хваставым апярэннем. Мэта гульні: не дапусціць падзення валана на сваім баку, а прызямліць яго на пляцоўцы праціўніка. Гуляюць 3—5 партый да ліку 15 у кожнай, а ў жаночых і дзіцячых сустрэчах да 11. Кожны год праводзяцца пяршынствы рэспублікі. З 1964 бел. бадмінтаністы ўдзельнічаюць у першынстве СССР.

Літ.: Марков О. Бадминтон, 3 изд., М., 1966.

БАДНАРСКІ Багдан Сцяпанавіч [23.6(5.7).1874—24.11.1968], савецкі бібліёграф. Засл. дз. нав. РСФСР (1945), д-р пед. н. У 1901 скончыў Маскоўскі ун-т, у 1911 — Маскоўскі археал. ін-т. Стварыў і рэдагаваў час. «Библиографическое известие» (1913—27, 1929). Старшыня Рускага бібліяграфічнага т-ва пры Маскоўскім ун-це (1920—29). Арганізатар і першы дырэктар (1920—21) Расійскай цэнтральнай (з 1936 Усесаюзнай) кніжнай палаты. Аўтар прац па бібліяграфіі і бібліятэказнаўстве. Пісаў пра бібліяграфічную справу ў БССР. Асн. праца «Бібліяграфія рускай бібліяграфіі. Бібліяграфічная літаратура з 1913 да 1929 гг.», т. 1—4 (1918—30).

Літ.: Богдан Степанович Боднарский. Указатель библиогр. трудов, М., 1944; Заслуженный деятель науки Богдан Степанович Боднарский, М., 1963.

Н. Б. Ватацы. Мінск.

БАДУЭН ДЭ КУРТЭНЭ (Baudouin de Courtenay) Іван (Ян) Аляксандравіч (1.3.1845, Радзымін — 4.11.1929), рускі і польскі моваznавец. Заснавальнік казанскай і пецярбургскай лінгвіст. школ. З сям'і каморніка. У 1866 скончыў гістор.-філал. ф-т Галоўнай школы (Варшаўскі ун-т). Праф. Казанскага (1875), Юр'еўскага (1883), Кракаўскага (1894), Пецярбургскага (1900) ун-таў. Акад. Кракаўскай (1887), чл.-кар. Пецярбургскай АН (1897). Першы пабудаваў тэорыю фанемы і фанетычных чаргаванняў. Працаваў у галіне тыпалагічнага вывучэння моў і выкарыстання колькасных метадаў у лінгвістыцы, даследавання эвалюцыі мовы і ўліку псіхічных фактараў пры аналізе моўных з'яў; вывучаў жывыя пар. гаворкі. Адрэдагаваў, напісаў прадмову, папоўніў матэрыяламі і перавыдаў «Тлумачальны слоўнік жывой вялікарускай мовы» У. Даля (3 выд., 1903—09; 4 выд., 1912—14). Выступаў у абарону правоў нац. меншасцей (у т. л. беларусаў) і іх моў. Запісваў і друкаваў (з потамі) бел. нар. песні («Беларуска-польскія песні з Сакольскага павета Гродзенскай губерні», 1892; «Дадатак да «Беларуска-польскіх песень з Сакольскага павета Гродзенскай губерні», 1894).



Тв.: Избранные труды по общему языкознанию, т. 1—2, М., 1963.

Літ.: И. А. Бодуэн де Куртенэ (к 30-летию со дня смерти), М., 1960 (бібліягр.).

БАДЭН (Bodin) Жан (1530—96), французскі мысліцель, прававед і дзяржаўны дзеяч. З сям'і юрысконсульта. Вывучаў права ў Тулузе, потым пераехаў у Парыж. Разглядаў грамадства як суму кроўна-гасп. саюзаў — сем'яў. У творы «Шэсць кніг пра дзяржаву» сфармуляваў сваё вучэнне пра дзяржаўны суверэнітэт. Адхіляў думку пра боскае паходжанне ўлады манарха, але абараняў ідэю спадчыннай манархіі. Гал. прычынай паліт. пераваротаў лічыў маёмасную няроўнасць. Адстойваў свабоду гандлю. Ідэі Б. ўплывалі на ўзнікненне колькаснай тэорыі грошай.

БАДЭН-БАДЭН (Baden-Baden), бальнеалагічны і кліматычны курорт у Бадэн-Вюртэмберзе, калля паўн.-зах. адгор'яў Шварцвальда (ФРГ). Горад акруговага падпарадкавання, 40,1 тыс. ж. (1965). Аэрапорт. Мяккі клімат з сярэднегадавой т-рай 9,7 °С. Асн. лячэбныя сродкі: радыеактыўная слабаміналізаваная вада (ванны і піццё), ванны з прыроднай пары гарачых крыніц, кіслародныя і гразевыя ванны. Лячэнне ад нетуберкулёзных хвароб органаў руху, перыферычнай нервовай сістэмы, парушэнняў абменных працэсаў, сардэчна-сасудзістых, страўнікава-кішачных і інш. хвароб. Сезон — увесь год.

БАДЭН-ВЮРТЭМБЕРГ (Baden-Württemberg), зямля на ПдЗ ФРГ. Пл. 35,7 тыс. *км*². Нас. 8565 тыс. чал. (1967). Адм. ц. Штутгарт. Займае частку Верхне-Рэйнскай нізіны, горы Шварцвальд (найб. выш. 1493 *м*), частку Баварскага пласкагор'я і Швабскага Альба, на Пд адгор'і Альпаў. Невял. радовішчы калійнай і спажыўной солі, жалезнай руды. Клімат умерана цёплы. Гал. рэкі: Рэйн з прытокам Некар, Дунай. На рэках ГЭС. Дрэваапр. і харч. прамысл. на мясцовай сыравіне, на прывазной — маш.-буд., тэкстыльная, электратэхн., хім., транспартнае машынабудаванне, выт. гадзіннікаў. Гал. гарады і прамысл. цэнтры: Штутгарт, Мангейм, Гейдэльберг, Карлсруэ; Фрэйбург. 53,4% зямлі выкарыстоўваецца ў с. гасп. (1962). Пасевы збожжавых, вінаградарства, садоўніцтва, агародніцтва, тытуняводства, жывёлагадоўля.

БАЕВА, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл., на р. Мярэя. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Дзяржынскага. За 28 *км* на ПдУ ад Дуброўна, 135 *км* ад Віцебска, 30 *км* ад чыг. ст. Пагодзіна, на шашы Дуброўна — в. Баева. 186 ж., двароў 52 (1970). Б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАЕЎСКІ ВЕК (ЯРУС), другі век сярэднеюрскай эпохі *юрскага перыяду* (другі знізу ярус сярэднеюрскага аддзела юрскай сістэмы). Устаноўлены франц. даследчыкам А. д'Арбіньі ў 1847. На Беларусі адкладамі Б. я. магутнасцю да 23 *м* пачынаецца разрэз сярэднеюрскіх утварэнняў. Фаўністычных рэштак у іх не знойдзена. Адклады вылучаны ўмоўна паводле становішча ў разрэзе, трапляюцца астравамі ў паўд. і цэнтр. частках Прыпяцкай упадзіны. У разрэзе Б. я. пароды лагунна-кантынентальнай фацыі — гліны алеўрыцістыя або тлустыя і пяскі тонказярністыя, кварцавыя, з мноствам абвугленых і пірытызаваных раслінных рэштак. У адкладах Б. я. ёсць вуглепраяўленні.

БАЖАН Мікола [Мікалай Платонавіч; н. 26.9(9.10).1904, г. Камянец-Падольскі], украінскі савецкі паэт і грамадскі дзеяч. Акад. АН УССР (1951). Засл. дз. нав. УССР (1966), засл. дз. маст. Груз. ССР (1964), нар. паэт Узб. ССР (1968). Чл. КПСС з 1940. У 1943—48 нам. старшыні Савета Міністраў УССР.



З сям'і ваеннага тапографа. Скончыў Уманскі каап. тэхнікум (1921), вучыўся ў Кіеўскім каап. ін-це, ін-це знешніх зносін. Друкуецца з 1923. Выступіў у л-ры як паэт рамант. стылю. Падзеям грамадз. вайны прысвечаны першы зб. «17-ы патруль» (1926). У зб. «Разьблёны цень» (1927) паэтызаваў мінулае Украіны. Да тэмы сацыяліст. буд-ва ўпершыню звярнуўся ў зб. «Будоўлі» (1929). Частцы вершаў кн. «Разьблёны цень», паэмам «Размова сэрцаў» (1928), «Гофманава ноч» (1929), «Гета ва Умані» (1930) уласціва ўскладненасць маст. выражэння, абстрактнасць вобразаў і малюнкаў, эксперыментаванне ў галіне слова і формы. У паэме-памфлеце «Смерць Гамлета» (1932) уславіў сацыяліст. гуманізм. Значнай з'явай л-ры сацыяліст. рэалізму стала паэма-трылогія «Бяссмерце» (1935—37), дзе на шырокім гісторыка-рэвалюц. фоне намаляваны вобраз С. М. Кірава. У творы выразна азначылася схільнасць паэта да манументальнасці ў апісанні, эпічнага паказу падзей, дакладнасці паэтычнага малюнка. Цыклы «Грузінскія вершы», «Узбекістанскія вершы», «Барыслаўскія апавяданні» (1939—40), зб. «Ямбы» (1940) пра дружбу народаў СССР. У Айч. вайну, будучы ў арміі, рэдагаваў газ. «За Радянську Україну!». Кн. «Сталінградскі сшытак» (1943, Дзярж. прэмія СССР 1946) пра гераізм сав. людзей, гуманізм сав. салдата. Пасля вайны, паведаўшы Англію, піша «Англійскія ўражанні» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1949). Вершы кнігі палітычна вострыя, напоўненыя пачуццём сав. нац. гордасці. Аўтар зб. «Ля Спаскай вежы» (1952), «Гады» (1957), «Яса» (1960), «Італьянскія сустрэчы» (1961), «Барвовасць» (1966) і інш. У 1965 за паэму «Палёт праз буру» (1964) атрымаў рэсп. літ. прэмію імя Шаўчэнкі. Пераклаў на укр. мову шматлікія творы рус., бел., груз., арм., узб. і інш. паэтаў. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—5-га скл. На XVII—XIX і XXI—XXIII з'ездах КПУ выбіраўся чл. ЦК. З 1958 гал. рэдактар Украінскай Савецкай Энцыклапедыі. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі.

Тв.: Твори, т. 1—2, Київ, 1965; бел. пер.— Бяссмерце. Мн., 1939; Выбраныя творы, Мн., 1954; рус. пер.— Стихи и поэмы, М., 1957; Полет сквозь бурю, М., 1967; Люди, книги, даты, М., 1968.

Літ.: Нісоноський П. Микола Бажан, Київ, 1959; Адельгейм Е. Микола Бажан, Київ, 1965; Майстер карбованого слова, Київ, 1964.

БАЖАНАЎ Аляксей Міхайлавіч (1820—89), рускі аграном і заатэхнік. Праф. аграноміі Горы-Горацкага с.-г. ін-та, праф. заатэхніі Ляснога ін-та ў Пецярбурзе. Магістарская дысертацыя «Пра вырошчванне пшаніцы з апісаннем парод, якія разводзіліся ў Расіі» (1856) была адной з першых спроб вывучыць мясцовыя сарты гэтай культуры. Прапагандаваў травасеянне і стварэнне кармавой базы для жывёлагадоўлі. Найб. вядомая праца «Дапаможнік па развядзенні, гадоўлі і выкарыстанні буйной рагатай жывёлы. Дастасаваны да кліматычных і сельскагаспадарчых умоў Расіі» (1867).

БАЖКО Алесь (Аляксандр Цімафеевіч; н. 22.10.1918, в. Даўгінава Навагрудскага павета Мінскай губерні), беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1951. З сялян. Вучыўся ў муз. ін-це імя Манюшкі ў Навагрудку (1936—38), Варшаўскай кансерваторыі (1938—39). Скончыў Літ. ін-т імя М. Горкага (1955). У гады Айч. вайны служыў у Сав. Арміі. У 1944—46 на камсамольскай рабоце. Працаваў у баранавіцкай і маладзечанскай абл. і ў рэсп. газетах (1946—62). З 1962 у выд. «Беларусь», з 1968 у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Друкуецца з 1947. Асобнымі кн. выйшлі: аповесць «Перад вераснем» (1959) пра жыццё сялян Зах. Беларусі; паэма «Карвіга пакідае хутар» (1961); аповесць «Позняе ворыва» (1963) пра калектывізацыю на Гродзеншчыне. Паэма «Татры» (1964) прысвечана антыфеад. руху бел., укр. і славацкага прыгоннага сялянства 17 ст., набрацімству слав. народаў, змацаванаму ў барацьбе за сац. і нац. вызваленне.

Тв.: Паэмы, Мн., 1968; Другое акно, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Лойко О. Зов таланта, «Дружба народов», 1968, № 11.

БАЖОРА Фёдар Максімавіч [15(28).2.1911, с. Елізаветаўка Данецкага пав. Данскога Войска вобл.— 4.7.1966], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1940. Ваяваў у складзе Мінскага Чырванасцяжнага палка. У чэрв.—ліп. 1944 удзельнічаў у вызваленні Дуброўна, Оршы, Барысава, ст. Жодзіна, Мінска, Гродна. Вызначыўся пры фарсіраванні Нёмана і Марыхі, у баях каля в. Гедзь і Высокі Мост на Пд ад Гродна. Узвод, якім камандаваў малодшы лейтэнант Б., пад шквальным агнём ворага пераправіўся на зах. бераг Нёмана, захапіў плацдарм і ўтрымліваў яго да падыходу гал. сіл.

БАЖОЎ Павел Пятровіч [15(27).1.1879—3.12.1950], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1918. Н. ў сям'і горназаводскага майстра паблізу Екацярынбурга (з 1924 Свярдлоўск). Скончыў Пермскую духоўную семінарыю (1899), выкладаў рус. мову. Быў добраахвотнікам Чырв. Арміі (1918). Першая кн. «Уральскія былі» (1924). У 1939 выйшлі аўтабіягр. аповесць «Зялёны конік» і напісаны па матывах уральскага фальклору зб. сказаў «Малахітавая шкатулка» (Дзярж. прэмія СССР 1943), пазней дапоўнены новымі сказамі («Ключ-камень», 1942; «Сказы пра немцаў», 1943; сказы пра Леніна, 1942—45; і інш.). Услаўляў патрыятызм і творчую працу рус. рабочых; творы яго — прыклад майстэрскага выкарыстання нар. мовы. Паводле сказаў Б. створаны кінафільм «Каменная кветка» (1946), опера К. Малчанава (паст. 1950) і балет С. Пракоф'ева (паст. 1954) «Сказ пра каменную кветку». Дэп. Вярх. Савета СССР 2—3-га скл. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

Тв.: Соч., т. 1—3, М., 1952; бел. пер.— Уральскія казкі, [пер. Я. Брыля], Мн., 1950; Уральскія сказы, [пер. М. Машары], Мн., 1950; Зялёны конік, [пер. М. Паслядовіча], Мн., 1959.

Літ.: Батин М. А., П. Бажов. Жизнь и творчество, 2 изд., М., 1963.

БАЖЫН Міхаіл Міхайлавіч [н. 7(20).9.1911, г. Мікалаеў], украінскі савецкі жывапісец. Нар. мастак СССР (з 1963), правадз. чл. Акадэміі мастацтваў СССР (1962), засл. дз. маст. УССР (1957). У 1933 скончыў Мікалаеўскі маст. тэхнікум. Аўтар партрэтаў: «Герой Савецкага Саюза Р. Кушлянскі» (1945), «Выдатніца Святлана Шыпунова» (1950); карціп: «Медсястра» (1955, сярэбраны медаль на міжнар. выстаўцы ў Бруселі 1958), «Думы, мае думы» (1960), «У. І. Ленін» (1961), «Дваццатае стагоддзе» (1967). Дэп. Вярх. Савета СССР 7-га скл.

Літ.: Шапошников Ф. Михайло Михайлович Божій, Київ, 1963.

БАЖЭНАЎ Васіль Іванавіч [1(12).3.1737, па некаторых звестках 1738, с. Дольскае каля Малаяраслаўца, па некаторых звестках Масква — 2(13).8.1799], рускі архітэктар, тэарэтык архітэктуры і педагог. Адзін з заснавальнікаў рускай школы *класіцызму*. Арх. адукацыю атрымаў у маск. «камандзе» (школе) арх. Дз. Ухтамскага (1753—55), Пецярбургскай АН (1756—58) і Акадэміі мастацтваў (1758—60; акад. з 1765; віцэ-прэзідэнт з 1799) у С. Чавакінскага і Ж. Б. Вален-Дэламота, у Парыжскай акадэміі архітэктуры ў Шарля дэ Вайі (1760—62) і ў Італіі (1762—64). За свае працы (сярод іх конкурсны праект Дома інвалідаў у Парыжы) выбраны прафесарам Рымскай, Фларэнтыйскай і Балонскай акадэмій. У творчасці Б. 60-х — пачатку 70-х г. найб. цікавыя праекты — палац на Каменным в-ве і Смольны ін-т у Пецярбурзе, Крамлёўскі палац у Маскве (1767—75), дзе намячалася перабудова Крамля. Паводле замыслу грандыёзны палац, што выходзіў на Маскву-раку, павінен быў злучыцца з амфітэатрам і авальнай плошчай для грамадскіх урачыстасцей; новыя вуліцы звязвалі Крэмль з гал. радыяльнымі магістралямі горада. Праект не быў здзейснены, Кацярына II спыніла буд-ва адразу пасля закладкі. Сярод пазнейшых работ Б.: грамадскія будынкі (праект Паўлаўскай бальніцы ў Маскве, 1784), цэрквы (у Пехра-Якаўлеўскім, Троіцкім-Кайнарджы пад Масквой, 1780; праект царквы для Сямёнаўскага палка, 1797), горадабудаўнічыя праекты (нездзейснены план Галернай гавані ў Пецярбурзе, 1796; вытворчыя будынкі ў Кранштаце, 1795—97), гарадскія і загарадныя сядзібы. Лепшыя творы Б. ў Маскве: б. Пашкоў дом (1784—86, стары будынак Дзярж. б-кі СССР імя Леніна), б. дом Долгава (1770) на 1-й Мяшчанскай (праспект Міру, д. 18) і інш. Кампазіцыйным цэнтрам цэлага раёна Пецярбурга стаў Міхайлаўскі палац (Інжынерны замак, 1797—1800, з арх. В. Брэна), які адыгрывае важную ролю ў ансамблі Марсавага поля. З імем Б. звязаны першыя пошукі стылю, заснаванага на творчым выкарыстанні матываў старажытнарускага дойлідства і готыкі: рэзідэнцыя Кацярыны II у Царыцыне (1775—85) пад Масквой. Тэарэт. погляды Б. выявіліся ў працах «Кароткае разважанне пра Крамлёўскае будаванне», у запісках пра рэарганізацыю Акадэміі мастацтваў і інш. Гуманіст, сябар М. Навікова, ён імкнуўся ўвасобіць у маст. вобразах перадавыя асветніцкія ідэі. Сцвярджаючы нац. своеасаблівасць рус. архітэктуры, Б. важнае значэнне надаваў асваенню спадчыны сусв. мастацтва. Глыбіня зместу, непаўторнасць ідэй, багацце арх.-маст. формаў, віртуознасць кампазіцыі — гэтыя рысы вызначаюць характар усёй творчасці Б. і яе надзвычай важнае месца ў гісторыі рус. дойлідства. Работы яго істотна ўплывалі на творчасць арх. М. Казакова, Е. Назарава, І. Яготава, М. Леграна, П. Аргунова, А. Вараніхіна.



Літ.: Михайлов А. И., Баженов, М., 1951; Ильин М. А., Баженов, М., 1954; Грабарь И. Э. и Гунькин Г. И., В. И. Баженов, у кн.: История русского искусства, т. 6, М., 1961.

Н. А. Еўсіна. Масква.

БАЗА (франц. base ад грэч. básis), аснова, фундамент, апорны пункт. 1) У архітэктуры — апора збудавання, п'едэстала, ніжняя частка калоны, пілястры (выключаючы дарычны ордэр). Б. калоны складаецца з кольцаў (прамалінейных і крывалінейных абломаў), якія расшыраюцца ўніз, і квадратнай апорнай пліты — плінта. 2) У тэхніцы — адлегласць паміж восямі апораў; участак вымярэння; паверхня дэталі, якою яна ўстанаўліваецца на кантрольнай прыладзе, станочным прыстасаванні ці адносна інш. дэталяў у механізме; электрод транзістара. 3) Склад, месца хавання тавараў, матэрыялаў; частка тэрыторыі з памяшканнямі і запасамі, неабходнымі для забеспячэння і абслугоўвання экспедыцыі, войск (гл. *Базы ваенныя*). 4) Установа, якая абслугоўвае каго-н., што-н. (напр., турысцкая Б.).

БАЗАЛЬТ (ад лац. basaltes камень з Базана ў Сірыі), кайнатыпная вулканічная горная парода асн. саставу. Эфузіўны аналаг *габра*.

Складаецца амаль з аднолькавай колькасці асн. плагіяклазу (лабрадору або бітаўніту) і аўгіту з дамешкай магнетыту, ільменіту, часта алівіну і вулканічнага шкла. Парода цёмная, шчыльная, звычайна няпоўнакрышталічная, часта парфіравай структуры. Поўнакрышталічны Б. называецца далерытам. Тэкстура порыстая або міндалекаменная. У міндалінах ёсць кальцыт, халцэдон, цэаліты і інш. мінералы. Б. утварае лавы многіх вулканаў (Камчаткі, Ісландыі, Гавайскіх а-воў), велізарныя покрывы і патокі на сушы і на дне акіянаў (у Азіі, Паўн. і Паўд. Амерыцы, на п-ве Індастан, у Ціхім ак. і інш.).

На Беларусі ёсць на ПдЗ у адкладах валынскай серыі верхняга дакембрыю (у Брэсц-

кай упадзіне). Выкарыстоўваецца як запаўняльнік бетону, як сыравіна для каменнага ліцця, у дарожным буд-ве.

БАЗЕЛЬСКІ МАНІФЕСТ 1912. Прыняты аднагалосна на кангрэсе 2-га Інтэрнацыянала 24—25.11.1912 у г. Базелі (Швейцарыя) у час 1-й Балканскай вайны (гл. *Балканскія войны*). На кангрэсе прысутнічала дэлегацыя РСДРП. Б. м. заклікаў міжнар. пралетарыят да барацьбы з пагрозай сусв. вайны. У ім гаварылася, што вайна будзе мець захопніцкі, імперыяліст. характар, яна рыхтуецца «дзеля прыбыткаў капіталістаў, славалюбства дынастый», і было б злачынствам, калі б рабочыя пачалі страляць адзін у аднаго. У. І. Ленін адзначаў, што ў Б. м. «...была прынята тактыка рэвалюцыйна-пралетарскай масавай барацьбы» (Тв., т. 22, с. 98). Аднак лідэры 2-га Інтэрнацыянала здрадзілі прынцыпам Б. м. і з пачаткам 1-й сусв. вайны падтрымалі імперыяліст. палітыку сваіх бурж. урадаў.


Літ.: Ленін У. І. Апартунізм і крах II Інтэрнацыянала, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); яго ж. Імперыялізм і раскол сацыялізма, Тв., т. 23 (Полн. собр. соч., т. 30).

БАЗІДЫЯЛЬНЫЯ ГРЫБЫ, клас вышэйшых грыбоў. Гл. *Грыбы*.

БАЗІЛЕВІЧ Мануіл (г. н. і см. невяд.), драматург сярэдзіны 18 ст. Вучыўся ў Кіеўскай акадэміі. З 1750 выкладаў піітыку ў Смаленскай калегіі. П'еса «Дэкламацыя», напісаная (1752—53) сілабічнымі вершамі на ўзор п'ес маралітэ ўкр. драматургаў В. Лашчэўскага і Г. Каніскага,— тыповы твор школьна-схаласт. л-ры. У алегарычных вобразах Б. выкрывае п'янства, грашалюбства, прадажнасць у судзе, заступаецца за бедных і прыніжаных. Мова п'есы старасламянская, але з вялікай колькасцю бел. слоў і формаў.

Тв.: у час. «Киевская старина», 1897, т. 58 (июль, авг., сент.) [у дадатку, с. 71—88].
Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 422—423.

БАЗІЛІКА (грэч. basilikē палац; у Афінах порцік, дзе засядаў архант-басілей), тып антычнага, а потым і сярэдневяковага будынка, прамавугольнага ў плане, раздзеленага ўздоўж шэрагамі калон на некалькі частак (т. зв. нефаў). Сярэдняя частка Б. звычайна вышэйшая і шырэйшая за бакавыя. Асвятленне натуральнае.



БАЗІС (у геадэзіі), лінія, якая непасрэдна вымяраецца на мясцовасці і служыць для вызначэння даўжынь іншых ліній, звязаных з базісам трыганаметрычным пабудаваннем. У залежнасці ад неабходнай дакладнасці Б. вымяраецца інварным ці стальным дротам, радыё- і святлодальнамерамі і інш. Б. выкарыстоўваецца ў трыянгуляцыі, *палігонаметрыі* і інш. выпадках, калі непасрэднае вымярэнне даўжыні ліній немагчыма.

БАЗІС І НАДБУДОВА, катэгорыі гістарычнага матэрыялізму, якія выражаюць сутнасць і заканамернасці ўзаемадзеяння матэрыяльных (эканамічных) і ідэалагічных грамадскіх адносін людзей. Базіс — сукупнасць вытворчых адносін, якія складаюць эканам. структуру грамадства. Надбудова — грамадскія, паліт., прававыя адносіны, ідэі і погляды (палітычныя, юрыдычныя, філасофскія, этычныя, эстэтычныя, рэлігійныя і інш.), а таксама адпаведныя ім установы і арг-цыі (дзяржава, паліт. партыі, царква, сістэма вышэйшай і сярэдняй адукацыі). Характэрныя асаблівасці базісу — гістар. зменлівасць, уласцівы толькі яму тып надбудовы. Базіс вызначае характар усіх грамадскіх працэсаў. Надбудову заўсёды спараджае пэўны базіс, але яна мае спецыфічныя заканамернасці і пэўную самастойнасць. У той час як палітычныя і прававыя формы свядомасці і адпаведныя ім установы і арг-цыі звязаны з базісам прама і непасрэдна, філасофскія, рэлігійныя і мастацкія погляды знаходзяцца ва ўскоснай сувязі з ім. У працэсе ліквідацыі старой надбудовы знішчаецца перш-наперш усё тое, што перашкаджае ўмацаванню і развіццю новага базісу і адначасова захоўваецца тое, што служыць яго развіццю і ўмацаванню. Надбудова актыўная ў адносінах да базісу, які яе спарадзіў, і памагае яму развівацца і ўмацоўвацца. Кожная грамадска-эканам. фармацыя мае толькі ёй уласцівыя Б. і н.

Гісторыі вядомы Б. і н. рабаўладальніцкага, феад., капіталіст. і камуніст. грамадстваў. Б. і н. антаганіст. грамадства антаганістычныя, і пераадолець антаганізмы ў межах гэтага грамадства немагчыма. Яны вырашаюцца шляхам рэвалюц. замены адной фармацыі другою, якая з'яўляецца больш высокай ступенню ў развіцці грамадства. У свой час узнікненне капіталіст. базісу ўнутры феадальнага прывяло да замены феадальных Б. і н. капіталістычнымі. У антаганіст. грамадстве класаваму характару базісу адпавядае і класавы характар надбудовы. Апошняя ўключае ідэі, установы і арг-цыі ўсіх класаў і сацыяльных груп гэтага грамадства. Аднак у межах надбудовы ў гэтым выпадку пануючае становішча займаюць ідэі і ўстановы тых класаў, якія пануюць і ў галіне эканомікі. У капіталіст. грамадстве ў склад надбудовы ўваходзяць ідэі і ўстановы як эксплуататарскіх, так і эксплуатаваных класаў. Яны па-рознаму ўздзейнічаюць на эканам. базіс. Калі бурж. дзяржава і права, бурж. грамадскія ідэі накіраваны на замацаванне і захаванне базісу, які існуе, то пралетарская ідэалогія і пралетарскія арг-цыі імкнуцца да яго карэннай змены.

Сацыялістычныя Б. і н. якасна адрозніваюцца ад Б. і н. ўсіх папярэдніх грамадска-эканам. фармацый сваімі сацыяльнымі функцыямі і спосабамі ўзнікнення і развіцця. Сацыяліст. базіс ствараецца толькі ва ўмовах замены старога грамадскага ладу новым у выніку ажыццяўлення сацыяліст. рэвалюцыі і ўстанаўлення дыктатуры пралетарыяту. Сацыяліст. надбудова ўзнікае і развіваецца на аснове новага, сацыяліст. базісу. У перыяд будаўніцтва сацыялізма і камунізма роля надбудовы, асабліва роля Камуністычнай партыі, Савецкай дзяржавы, грамадскіх арганізацый, марксісцка-ленінскай ідэалогіі узмацняецца. У сацыяліст. грамадстве, дзе няма сацыяльных антаганізмаў, Б. і н. не з'яўляюцца антаганістычнымі, яны дзякуючы сваёй асобнай сацыяльнай прыродзе маюць магчымасць пастаяннага прагрэсіўнага развіцця.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, разд. 1, Соч., т. 3; Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952. Прадмова; Энгельс Ф. Письмо К. Шмидту, 5 августа 1890 г., Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 37; яго ж. Письмо Ф. Мерингу, 14 июля 1893 г., там жа, т. 39; Ленін У. І. Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць сацыял-дэмакратаў?, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); яго ж. Тры крыніцы і тры састаўныя часткі марксізма, Тв., т. 19 (Полн. собр. соч., т. 23); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 33). *А. П. Ратайка.* Мінск.

БАЗІС ЭРОЗІІ, узровень, да якога імкнецца водны паток пры паглыбленні рэчышча. Галоўны (агульны або ніжні) Б. э.— узровень мора ці сусв. акіяна. Мясцовы Б. э. вызначаецца ўзроўнем ракі (або, паводле інш. меркаванняў, яе дна) у месцы ўпадзення прытока. З паніжэннем Б. э. працэсы паглыблення (глыбінная эрозія) паскараюцца. Пры дасягненні Б. э. падоўжны профіль ракі робіцца больш спадзісты, паглыбленне рэчышча замаруджваецца, меншае жывая сіла ракі, адкладаюцца напосы (гл. *Алювій*). Паніжэнне Б. э. вядзе да ўтварэння рачных тэрас.

БАЗІФІКАЦЫЯ (асноўны метасаматоз), хімічная перапрацоўка гранітнага слоя кантынентальнай зямной кары ў базальтавы матэрыял кары акіянічнага тыпу. Паводле гіпотэзы пра ўтварэнне акіянічных упадзін пры абрушэнні (асяданні) гранітнага слоя, яго Б. адбываецца ў цвёрдым стане шляхам паступовага замяшчэння (метасаматозу) часткі шчолачаў і крамянязёму магніем, кальцыем, жалезам.

БАЗЫ ВАЕННЫЯ, важныя ў стратэгічных адносінах пункты (раёны, тэрыторыі), прыстасаваныя для размяшчэння вялікіх вайсковых злучэнняў і запасаў зброі, боепрыпасаў, прадуктаў і інш. відаў забеспячэння. Паводле прызначэння і абсталявання падзяляюцца на сухапутныя, ваенна-марскія, ваенна-паветраныя і мяшаныя (для абслугоўвання адначасова ўсіх родаў войск). З даўніх часоў захоп прыбярэжных пунктаў і асобных раёнаў для стварэння Б. в. вызначаў кірунак каланіяльнай экспансіі. Асаблівае значэнне Б. в. набылі ў эпоху імперыялізму. Капіталіст. дзяржавы размясцілі на тэрыторыі залежных ад іх краін і ў калоніях вялікую колькасць ваенных баз, каб душыць нац.-вызв. барацьбу занявоеных народаў. Пасля 2-й сусв. вайны ЗША, Вялікабрытанія і інш. імперыяліст. дзяржавы з мэтай агрэсіі стварылі за мяжой яшчэ больш шырокую сетку сваіх баз, асабліва паблізу граніц СССР і інш. сацыяліст. краін. ЗША маюць больш як 400 буйных і каля 3 тыс. дробных ваен. баз амаль у 40 краінах. СССР, міралюбныя сілы свету змагаюцца за ліквідацыю ваенных баз на чужых тэрыторыях. *М. В. Яшнікаў.* Мінск.

БАЗЫЛЕВІЧ Аляксандр Мікітавіч [н. 1(14).3.1905, в. Гарадзец Лепельскага пав. Віцебскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1929. У 1932 скончыў Гомельскую саўпартшколу. Да Айч. вайны на парт. рабоце. З ліп. 1941 у Чырв. Арміі. З 25.4.1942 у партызанах. З 20.12.1942 камісар партыз. атрада «Разгром», з 20.5.1943 камісар *партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь»*, з 20.10.1943 яе камандзір. Пасля вайны на парт. і прафс. рабоце. Узнаг. ордэнамі Леніна, Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Мінску.

Літ.: Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941—1944), Мн., 1961.

БАЗЫЛІК (Bazylik) Цыпрыян (каля 1535, Серадз — пасля 1600), польскі перакладчык, паэт, музыкант, грамадскі дзеяч. Дзейнасць Б. цесна звязана з Беларуссю, яго творы перакладаліся на бел. мову. Прыбл. з 1556 працаваў як музыкант у князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Меў друкарню ў Брэсце (прыбл. да 1570), дзе выдаваў рэфармацыйныя творы. Песні Б. ўвайшлі ў пратэстанцкі канцыянал (песенны зборнік), выдадзены ў Брэсце (1558, друкарня Яна Зарэмбы).

Літ.: Порецкая Н. Первое белорусское «до», «Неман», 1966, № 7.

БАЗЫЛЬЯНЕ (лац. basiliani), манахі ордэна каталіцкай царквы з праваслаўным абрадам. Ордэн створаны паводле статута, складзенага пібыта багасловам Васілём Вялікім (4 ст.). Першапачаткова ўзнік у Візантыі. У Вял. кн. Літ. першы манастыр Б. заснаваны ў канцы 15 ст. Пасля *Брэсцкай уніі 1596* ордэн Б., рэарганізаваны папствам, актывізаваў сваю дзейнасць і стаў адным з правадпікоў каталіцкага ўплыву на Беларусі, Украіне, у Літве. Да сярэдзіны 17 ст. манастыры Б. на Беларусі былі ў Гродне, Кобрыне, Мінску, Мсціслаўлі, Жыровічах, Полацку, Навагрудку, Магілёве, Чарэі, Пінску, Быцені і інш. У пач. 19 ст. ордэну належала каля 20 000 сялян. Ордэн меў школы з пач. і сярэдняй адукацыяй. У канцы 17—1-й пал. 18 ст. школы Б. былі ў Брэсце, Віцебску, Полацку, Ружанах, Баркалабаве, Талачыне, Ушачах, Вішневе, Чарэі і інш. Каля 1641 заснавана семінарыя ў Мінску. Польскія магнаты выкарыстоўвалі Б. для акаталічвання і паланізацыі бел., укр. і літ. насельніцтва. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Б. пад націскам праваслаўнай царквы пачалі траціць значэнне. Канчаткова іх манастыры ліквідаваны ў Расійскай імперыі ў сярэдзіне 19 ст.

А. А. Варанавічус. Вільнюс;
В. К. Дарашэвіч. Мінск.

БАЗЭ — ЭЙНШТЭЙНА СТАТЫСТЫКА, гл. *Квантавая статыстыка*.

БАЙБАК, стэпавы сурок (Marmota bobac), грызун сямейства вавёркавых. Даўж. да 60 *см*, хвост каля 14 *см*. Поўсць кароткая, мяккая, пясочна-жоўтая са слабымі цёмнымі плямкамі. Лапы кароткія з моцнымі кіпцюрамі, добра прыстасаваныя рыць зямлю. Б. пашыраны ў стэпавай і лесастэпавай палосе



Усх. Еўропы і Казахстана. Тыповы дзённы грызун. Жыве сем'ямі, у норах. На зіму ўпадае ў сплячку, назапасіўшы тлушчу (да 30% ад сваёй масы). Корміцца дзікай травяністай расліннасцю. Аб'ект промыслу (выкарыстоўваюцца шкурка, мяса, тлушч). Ворыва цаліны і празмернае паляванне на яго значна зменшылі колькасць Б. Уцалелыя калоніі ахоўваюцца.

БАЙБАКОЎ Мікалай Канстанцінавіч (н. 7.3.1911, с. Сабунчы каля Баку), савецкі дзяржаўны дзеяч. З рабочых. Чл. КПСС з 1939. У 1932 скончыў Азербайджанскі нафтавы ін-т. Д-р тэхн. н. (1966). У 1937 гал. інжынер, кіраўнік трэста «Леніннафта», у 1938 кіраўнік аб'яднання «Усходнафтаздабыча», у 1939 нач. «Галоўусходнафта з д абыча». З 1940 нам. наркома, з ліст. 1944 нарком нафтавай прамысл. СССР. У 1946—48 міністр нафтавай прамысл. паўд. і зах. раёнаў СССР, з 1948 міністр нафтавай прамысл. СССР. У 1955—57 старшыня Дзяржплана СССР. У 1957—58 старшыня Дзяржплана РСФСР, нам. старшыні Савета Міністраў РСФСР, потым старшыня Краснадарскага, Паўн.-Каўказскага саўнаргасаў. З 1963 міністр СССР, старшыня Дзярж. к-та па хіміі пры Дзяржплане СССР, з 1964 міністр СССР, старшыня Дзярж. к-та нафтаздабываючай прамысл. пры Дзяржплане СССР. З 1965 нам. старшыні Савета Міністраў СССР, старшыня Дзяржплана СССР. На XIX, XX, XXIII з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 2, 4, 5, 7 і 8-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Ленінская прэмія 1963.



БАЙДА, герой украінскай народнай «Песні пра Байду» («В Цареграді, на риночку»), вызначаецца любоўю да Радзімы, патрыятызмам. Варыянт бел. гістар. песні пра слуцкага рыцара Б., які забіў цара, змешчаны ў кн. А. Рыпінскага «Беларусь» (Парыж, 1840).

БАЙДАК, рачное аднавёсельнае драўлянае судна з плоскім днішчам, звужаным носам і кармой. Было пашырана на Беларусі і Украіне. У 16—19 ст. на Б. перавозілі грузы па Дняпры і яго прытоках. Запарожскія казакі выкарыстоўвалі Б. як ваеннае судна.

БАЙДАРКА, гл. *Лодкі*.

БАЙДУКОЎ Георгій Піліпавіч [н. 13(26).5.1907, раз'езд Тарышыта Омскай чыгункі], савецкі лётчык. Герой Сав. Саюза (1936). З рабочых. У 1935 скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, у 1951 Акадэмію Ген. штаба. З В. П. *Чкалавым* і А. В. *Беляковым* удзельнічаў у беспасадачных пералётах Масква — Портленд (ЗША) цераз Паўн. полюс (чэрв. 1937). У Айч. вайну ген.-л. В. камандаваў авіяцыйнымі злучэннямі. З 1951 у Мін-ве абароны СССР. Аўтар кніг: «Наш палёт у Амерыку» (1937), «Запіскі пілота» (1938), «Пра Чкалава» (1939).

БАЙКА, невялікі, звычайна вершаваны, алегарычны твор павучальна-гумарыстычнага ці сатырычнага характару. Чалавечае жыццё адлюстроўвае ў вобразах жывёл, раслін, рэчаў або зводзіць да ўмоўных адносін. Часта Б. мае дыялагічную форму, што надае дзеянню напружанне, індывідуалізуе персанажаў. У гісторыі сусв. Б. вядомы стараж.-грэч. байкапісец Эзоп (6—5 ст. да н. э.), стараж.-рым. Федр (1 ст. н. э.). У франц. л-ры жанр Б. распрацаваў Ж. Лафантэн, у рус. І. Крылоў, ва ўкр. Г. Скаварада. Першыя бел. байкі Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, А. Абуховіча ўзнікалі часта як наследаванне І. Крылову. У творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча Б. стала самабытнай, наблізілася да сацыяльных і нац. патрэб народа, выразна акрэсліліся яе жанравыя асаблівасці. Бел. Б. набыла высокае грамадскае гучанне і дасканаласць у К. Крапівы («Сава, Асёл ды Сонца», «Жаба ў каляіне», «Дыпламаваны баран»). Сярод сучасных бел. байкапісцаў вылучаюцца У. Корбан і Э. Валасевіч.

Літ.: Казека Я. Беларуская байка, Мн., 1960.
В. П. Рагойша. Мінск.

БАЙКАЛ, возера ў РСФСР у паўд. частцы Усх. Сібіры (у Бурацкай АССР і Іркуцкай вобл.). 455 *м* над узр. м. Пл. 31,5 тыс. *км*², даўж. 636 *км*, найбольшая шыр. 79,4 *км*, найбольшая глыб. 1620 *м* (самае глыбокае возера ў свеце). Па агульным аб'ёме водных масы (23 тыс. *км*³) перавышае Балтыйскае м., Белае (у 4,3 раза), Аральскае (у 23 разы). Пл. вадазбору звыш 550 тыс. *км*². У Б. упадае больш як 300 рэк. Самыя вялікія: Селенга, Баргузін, Верхняя Ангара. Выцякае р. Ангара, якая выносіць з возера за год каля 61 *км*³ вады. Катлавіна возера тэктанічнага паходжання. Раён Б. высокасейсмічны. Налічваецца да 22 а-воў (агульная пл. каля 742 *км*²), найбольш вялікія Альхон і Вял. Ушкановы. Б. акружаны горнымі хрыбтамі. Берагавая лінія слаба парэзана. Самыя вялікія заліны ў сярэдняй частцы возера: Баргузінскі, Чывыркуйскі (раздзеленыя п-вам Святы Нос), Правал. Т-ра вады на паверхні ў жніўні ў адкрытай частцы 12—14, каля берагоў 18—20 °С, у глыбінных слаях амаль пастаянная ўвесь год (3,2—3,5 °С). Ледастаў з канца снежня — пач. студзеня да пач. мая. У вытоку Ангары возера не замярзае. На Б. складаная сістэма вятроў: з ПнЗ — ураганны вецер «сарма», з ПнУ, з далiны Верхняй Ангары — «ангара», або «верхавік», з ПдЗ — «култук», з У — «баргузін». Вада празрыстая і мала мінералізаваная. Флора і фаўна налічвае каля 1800 відаў, з іх ³/₄ эндэмікі: бычкі, жывародная рыба галамянка і інш. Прамысл. рыбы: байкальскі омуль, сігі, харыус, часцікавыя і інш. Водзіцца байкальскі цюлень (нерпа). Развіты рыбалоўства, лесасплаў. Возера суднаходнае. Гал. прыстані: Байкал, Лісцвянка, Танхой, Усць-Баргузін. У г. п. Лісцвянка Лімналагічны інстытут Сібірскага аддз. АН СССР.

Літ.: Россолимо Л. Л. Байкал, М., 1966; Верещагин Г. Ю. Байкал, М., 1949.
В. А. Калечыц. Мінск.



Байкал. Бухта Пясчаная.

БАЙКАЛЬСКАЯ СКЛАДКАВАСЦЬ (асінцкая складкавасць), буйныя гораўтваральныя (арагенічныя) працэсы ў тэктанічнай гісторыі Зямлі ў канцы пратэразою — пачатку кембрыю, перад каледонскай складкавасцю. Вылучана ўпершыню пад назвай байкальскай, або рыфейскай, у 1935 сав. геолагам М. С. Шацкім, у 1944 ням. геолаг Г. Штыле назваў яе асінцкай. Б. с. былі ахоплены прылеглыя да старажытных платформаў вял. тэрыторыі на З і У сучаснай Паўд. Амерыкі, у цэнтр. і ўсх. частках Азіі, на Пд, З і ПнУ Еўропы, адзнакі яе вядомы ў Паўн. Амерыцы, Афрыцы і Аўстраліі. У байкальскую тэктанічную эпоху ў межах стараж. Рускай платформы і інш. узнікла дыяганальная сістэма вял. лінейных грабенаў *(аўлакагенаў)*. Значная частка абласцей Б. с. (байкалід) была перапрацавана працэсамі наступных (каледонскай, герцынскай, мезазойскіх і альпійскай) складкавасцей. Сярод складкавых паясоў захаваліся выступы байкальскіх складкавых структур у Еўропе (Ціманскі краж), Азіі (Прыбайкальская горная вобл., Енісейскі краж і інш.), Паўд. Амерыцы, Афрыцы.

БАЙКАЛЬСКІЯ НЕАЛІТЫЧНЫЯ КУЛЬТУРЫ, культуры плямёнаў Прыбайкалля. Вядомы 4 этапы: 1) хінскі (5-е тысячагоддзе да н. э.), звязаны з эпохай мезаліту, паяўляюцца лук і стрэлы; 2) ісакаўскі (4 — пач. 3-га тысячагоддзя да н. э.). Асноўны занятак насельніцтва — паляванне; посуд грубы, вастрадонны; арнамент — сетка-пляцёнка і круглыя ямкі каля венчыка; 3) сяроўскі (3-е тысячагоддзе да н. э.). Павышаецца тэхніка апрацоўкі вырабаў; з'яўляюцца рэтушаваныя нажы, накапечнікі коп'яў, укладышы, лук з касцянымі абкладкамі; пачынаецца рыбалоўства; посуд шарападобнай формы; 4) кітойскі (канец 3 — пач. 2-га тысячагоддзя да н. э.). Аснова гаспадаркі — рыбалоўства; узнікае патрыярхат: пахаванні парныя, мужчынскія магілы больш багатыя.

Літ.: Киселев С. В. Древняя история Южной Сибири, М.—Л., 1949 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 9).

БАЙКАНУР, касмадром у Карагандзінскай вобл. Казахскай ССР, адзін з самых вялікіх у Савецкім Саюзе. Мае стартавыя комплексы, вымяральныя пункты і інш. тэхн. абсталяванне для правядзення разнастайных праграм касмічных даследаванняў. З Б. запушчаны першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі, стартавалі першы ў свеце касманаўт Ю. А. *Гагарын* і першая ў свеце жанчына-касманаўт В. У. *Нікалаева-Церашкова*; выведзены на зададзеную арбіту серыя пілотных касмічных караблёў, многа касм. станцый, штучных спадарожнікаў Зямлі розных тыпаў. З Б. запускаюцца касм. ракеты ў бок Месяца, Марса і Венеры.

БАЙКЕН (Зімовы жоўты, Позні зімовы), зімовы сорт яблыні. Плады буйныя (150—300 *г*), тупаконусныя, рабрыстыя, светла-жоўтыя з невялікім румянцам. Мякаць сакаўная, кісла-салодкая. Свежыя плады могуць зберагацца да чэрвеня. Сорт марозаўстойлівы, стойкі да хвароб, патрабуе вільготнай і ўрадлівай глебы. Раяніраваны ў паўд. абласцях РСФСР, УССР, БССР, у Малдавіі і Грузіі. Пладаносіць на 5—7-ы год, у 25 гадоў дае каля 240 *кг* пладоў з дрэва. Апыляльнікі: Шафран-кітайка, Уэлсі, Славянка і Ранет Ландбергскі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Яблыня*.

БАЙКІ, вёска ў Вольскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. За 40 *км* на ПнУ ад Пружан, 130 *км* ад Брэста, 38 *км* ад чыг. ст. Іванцэвічы, каля шашы Пружаны — г. п. Ружаны (100 *м*). 237 ж., двароў 58 (1970). Аддз. сувязі. У Вял. Айч. вайну актывісты рэвалюц. руху Зах. Беларусі, былыя чл. КПЗБ стварылі ў Б. антыфашысцкую арганізацыю. У Б. пэўны час знаходзіўся *Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт*. На сядзібе Максіма Барана была абсталявана падпольная друкарня, дзе выдаваліся лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, газеты — газета Брэсцкага абл. антыфашысцкага к-та «За Родину». Друкарня праіснавала з кастр. 1942 да крас. 1943. Акупанты люта расправіліся з жыхарамі вёскі. 22.1.1944 усіх іх сагналі ў вялікі хлеў. Мужчын расстрэльвалі групамі па 6—7 чал., жанчын спальвалі жывымі. Пакутлівую смерць прыдумалі фашысты дзецям — на іх нацкавалі сабак. Пакалечаныя дзіцячыя целы фашысты кідалі ў агонь. Загінула 957 чал., спалена 130 двароў. У адбудаванай вёсцы ахвярам фашызму ўстаноўлены абеліск і мемарыяльныя дошкі. Адноўлена зямлянка, у якой была падпольная друкарня.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944, 2 изд., Мн., 1965, с. 134. *А. С. Барысавец, Т. А. Слесарук.* Брэст.

БАЙКОТ (англ. boycott), спосаб палітычнай і эканамічнай барацьбы, калі цалкам або часткова спыняюцца адносіны з якой-н. асо-

бай, арганізацыяй ці дзяржавай. Ужываецца: а) у эканам. і паліт. барацьбе працоўных супраць капіталіст. эксплуатацыі; б) у барацьбе народаў калан. і залежных краін супраць імперыяліст. прыгнёту; в) у барацьбе капіталістаў супраць рабочых (т. зв. чорныя спісы «ненадзейных» рабочых, каб яны не маглі паступіць на работу ні на адно прадпрыемства); г) як форма барацьбы двух лагераў у міжнар. палітыцы, напр., пасля Кастр. рэвалюцыі імперыяліст. дзяржавы доўгі час не прызнавалі СССР (ЗША да 1933) і арганізавалі эканам. Б. (адмаўляліся гандляваць, не давалі крэдыту і г. д.). ЗША і некаторыя інш. краіны Лац. Амерыкі пасля ўстанаўлення народнай улады на Кубе (1959) праводзяць палітычны і эканамічны Б. Кубы (парвалі дыпламат. адносіны, спынілі гандаль і г. д.).

БАЙКОЎ Аляксандр Аляксандравіч [25.7 (6.8).1870, г. Фацеж Курскай губ.— 6.4.1946], савецкі вучоны ў галіне металазнаўства, металургіі і хіміі. Акад. АН СССР (1932, чл.-кар. 1927), Герой Сац. Працы (1945). Скончыў фіз.-матэм. ф-т Пецярбургскага ун-та (1893). З 1903 праф. Пецярбургскага політэхн. ін-та. У 1909 даказаў існаванне аўстэніту траўленнем сталі і жалеза сухім хлорыстым вадародам пры высокай т-ры ў атмасферы азоту, знайшоў полімарфізм нікелю, раскрыў прыроду графіту і цэментыту ў жалезавугляродзістых сплавах. У галіне металургіі даследаваў фіз.-хім. ўмовы пераўтварэння адных вокіслаў жалеза ў другія і распрацаваў тэорыю акісляльных і аднаўленчых працэсаў. Заснавальнік сав. школы металазнаўцаў. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га і 2-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1943.



Тв.: Собрание трудов. (Отв. ред. И. П. Бардин), т. 1—5, М.—Л., 1948—1952.

Літ.: Тумарев А. С. Александр Александрович Байков — выдающийся металлург и химик, М., 1954.

БАЙКОЎ Аляксей Георгіевіч [н. 17(30).3. 1906, в. Гаўрылава Шуйскага пав. Уладзімірскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1939. Удзельнік баёў з японцамі на р. Халхін-Гол (1939), вызваленні Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны (1939—40). Увосень 1941 арганізаваў партыз. групу, якая ў маі 1942 увайшла ў партыз. атрад «Мсцівец» Мінскай вобл., у крас. 1943 — у атрад імя Аляксандра Неўскага, які дзейнічаў у Юрацішкаўскім р-не Баранавіцкай вобл., і 16.4.1944 ператвораны ў *партызанскую брыгаду імя Аляксандра Неўскага*, камандзірам якой быў Б. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

БАЙКОЎ Андрэй Пракопавіч [н. 19.8(1.9). 1915, в. Пясочная Буда Гомельскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў у жн. 1942 Асобы Бел. абор і накіраваны ў тыл ворага, дзе ўзначаліў партыз. атрад. З вер. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя М. А. Шчорса*, якая дзейнічала ў Уваравіцкім і Рэчыцкім р-нах Гомельскай вобл. Са снеж. 1943 на сав. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Ветцы Гомельскай вобл.

БАЙКОЎ Мікалай Якубавіч [псеўд. Крывіч Мікола; 10(22).2.1889, г. Бежацк Цвярской губ.— 23.6.1941], беларускі лінгвіст і літаратуразнавец. Скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію (1913). Выкладаў філас. і пед. дысцыпліны ў навуч. установах Мінска (1913—21). Вучоны сакратар слоўнікавай камісіі Інбелкульта (1922—28), потым Ін-та мовы АН БССР. Аўтар артыкулаў па педагогіцы («Аснoўныя прынцыпы арганізацыі школы», 1921; «Нарысы па гісторыі ідэі працоўнага выхавання», 1922), бел. л-ры і мове («Паэма «Новая зямля» як манументальны твор беларускай паэзіі», 1923; «Да пытання аб чужаземных словах у нашай мове», 1927; «Месца Янкі Купалы ў беларускай літаратуры», 1928). З М. Гарэцкім выдаў «Практычны расійска-беларускі слоўнік» (1924, 2 выд. 1926); з С. Некрашэвічам «Беларуска-расійскі слоўнік» (1925) і «Расійска-беларускі слоўнік» (1928); з А. Баранoўскім «Практычны беларускі вайсковы слоўнік» (1927).

І. К. Германовіч. Мінск.

БАЙРАМ-АЛІ, кліматычны курорт у аазісе паўднёвай часткі пустыні Каракумы. Чыг. ст. Байрам-Алі, каля 370 *км* ад Ашхабада. Лекавы фактар — клімат, блізкі да клімату Егіпта: гарачае сухое лета (т-ра больш за 30 °С), цёплыя сухія вясна і восень, мяккая зіма. Сонечна 2908 гадзін у год. Лечаць хворых з хранічным паражэннем нырак туберкулёзнага паходжання (нефрозы і нефрыты). Асн. метады лячэння: аэратэрапія, дыэтатэрапія, санаторны рэжым. Сезон з 1 крас. да 1 снеж. Санаторый разлічаны на 420 ложкаў; лячэбна-дыягнастычныя кабінеты, водалячэбніца, аэрарый, парк.

БАЙРАН (Byron) Джордж Ноэл Гордан (22.1.1788, Лондан — 19.4.1824), англійскі паэт, выдатны прадстаўнік рэвалюцыйнага рамантызму. З арыстакр. роду (у 1798 атрымаў па спадчыне тытул лорда). Дзяцінства прайшло ў г. Абердзін (Шатландыя). Скончыў арыстакр. школу ў г. Хараў, Кембрыджскі ун-т (1808). З 1809 чл. Палаты лордаў Брыт. парламента. У 1809 — 11 падарожнічаў па Б. Усходзе і Паўд. Еўропе. 27.2. 1812 выступіў у парламенце з прамовай у



абарону ўдзельнікаў першых рабочых выступленняў — *луддзітаў*. Пасля шлюбаразводнага працэсу, які суправаджаўся цкаваннем з боку рэакц. колаў, пакінуў Англію (25.4.1816). У 1816—17 жыў у Швейцарыі, дзе зблізіўся з П. Б. *Шэлі*. Актыўна ўдзельнічаў у руху *карбанарыяў* (1817—23) і ў нац.-вызв. вайне ў Грэцыі (1823—24). Памёр ад ліхаманкі ў ваенным лагеры (г. Місалунгі). Сэрца паэта пахавана ў Грэцыі, а цела на радзіме, недалёка ад родавага маёнтка Ньюстэд. Першы зб. «Вольныя часіны» (1807) адзначаны рысамі рамант. светаадчування. Сатыр. паэма «Англійскія барды і шатландскія аглядальнікі» (1809) — рэзкае выступленне супраць рэакц. тэндэнцый у англ. л-ры і крытыцы тых часоў. У 1812 надрукаваны 1-я і 2-я песні «Паломніцтва Чайльд Гарольда»; у іх Б. пранікнёна перадаў расчараванне і горыч сваіх сучаснікаў, ашуканых вынікамі франц. бурж. рэв. 18 ст. У 3-й і 4-й песнях (1817—18) паэма набывае эпічны размах, на першым плане — думкі аўтара пра гісторыю і сучаснасць. Паэт услаўляе нац.-вызв. рух, асуджае захопніцкія войны. «Ода аўтарам біля супраць разбуральнікаў станкоў» (1812) і «Песня для лудзітаў» (1816) выкрываюць рэакц. палітыку ўрада і апраўдваюць справядлівы нар. бунт. Цыкл вершаў на біблейскія сюжэты «Яўрэйскія мелодыі» (1815), лірыка 10-х г., т. зв. ўсходнія паэмы «Гяур» і «Абідоская нявеста» (1813), «Карсар» і «Лара» (1814), «Асада Карынфа» і «Парызіна» (1816) развіваюць матывы бунту і непрыкаянасці першых песняў «Паломніцтва...». У паэмах паказаны грандыёзныя чалавечыя страсці на фоне стылізаванай экзотыкі Усходу. Герой іх абвяшчае вайну гр-ву, яго законам і замыкаецца ў гордай адзіноце. У філас. паэмах, ці «містэрыях», «Манфрэд» (1817), «Каін» (1821), «Неба і зямля» (1822) бунтарскія матывы «ўсходніх паэм» пераходзяць у багаборніцкія. Свабадалюбствам прасякнуты «Шыльёнскі вязень» (1816), «Скарга Таса» (1817), «Прароцтва Дантэ» (1819), «Востраў» (1823). Дзейнасць карбанарыяў і прычыны разгрому іх руху атрымалі філас. асэнсаванне ў драмах на гістар. і біблейскія сюжэты «Марына Фальера, дож Венецыі» (1821), «Сарданапал» (1821), «Два Фаскары» (1821), якія спалучаюць элементы паэтыкі рамантызму і класіцызму. З канца 10-х г. у творчым метадзе Б. намячаецца паварот да рэалізму. Паэма «Бепа» (1818) — рэаліст.-бытавая сатыра. У паліт. сатырах «Ірландская аватара» (1821), «Прывід суда» (1822) і «Бронзавы век» (1823) сучаснасць паўстае ў канкрэтных, гратэскавых вобразах. Вяршыня творчасці паэта — раман у вершах «Дон Жуан», няскончаны на 17-й песні. У ім бязлітасны маральны суд над пегераічнай сучаснасцю, выкрыццё сацыяльнага і нац. рабства, мілітарызму і дварапска-бурж. маралі. Эпічны размах рамана спалучаецца з лірычнымі адступленнямі, літ. і паліт. палемікай, з'едлівай пародыяй. Рамант. экзотыка першых песняў паступова саступае месца рэаліст. апавяданню. Творчасць Б. моцна ўплывала на развіццё сусв. паэзіі 19—20 ст. На бел. мову Б. перакладалі Ю. Гаўрук, У. Дубоўка, Я. Семяжон і інш.

Тв.: Бел. пер.— Выбранае, Мн., 1963; рус. пер.— Избранные произведения, Мн., 1939, [уступны арт. А. В. Луначарскага]; Избранное, М., 1964; Дон Жуан, пер. Т. Гнедича, М.—Л., 1964; тое ж, пер. Г. Шенгели, М., 1947; Дневники.— Письма, М., 1965; Лирика, М.—Л., 1967.

Літ.: Елистратова А. А. Байрон, М., 1956; яе ж. Наследие английского романтизма и современность, М., 1960; Кургинян М. Джордж Байрон, М., 1958.

БАЙСЕЙТАВА Куляш (2.5.1912, Верны — 6.6.1957), казахская савецкая спявачка (лірычнае сапрана). Нар. арт. СССР (1936). Чл. КПСС з 1943. З 1933 салістка т-ра оперы і балета імя Абая (Алма-Ата). Паспяхова выступала ў нацыянальным (Сара ў оперы М. Тулебаева «Біржан і Сара», Дзярж. прэмія СССР 1949; Акжунус і Кыз-Жыбек у операх Я. Брусілоўскага «Ер-Таргын» і «Кыз-Жыбек») і ў класічным оперным рэпертуары. Дзярж. прэмія СССР 1948 за канцэртна-выканальніцкую дзейнасць. З 1965 у Каз. ССР устаноўлена прэмія па музыцы імя Б.

БАЙЦОЎ Аляксандр Герасімавіч [н. 14(27). 10.1904, в. Бешкіна Гдоўскага пав. Пецярбургскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1927. На фронце з чэрв. 1941. Вызначыўся ў Брагінскім р-не Палескай вобл. 26—27.10.1943 полк пад камандаваннем падпалкоўніка Б. на падручных сродках фарсіраваў Дняпро і замацаваўся на захопленым плацдарме, што памагло пераправіцца ўсёй дывізіі. Жыве ў Маскве.

БАЙЦОЎ Іван Паўлавіч [н. 17(29).7.1896, Шуйскі пав. Уладзімірскай губ.], партыйны дзеяч, адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Калінінскай вобл. ў Айч. вайну. Чл. КПСС з 1919. Удзельнік грамадз. вайны. З 1925 на парт. рабоце ў Ленінградзе і Ленінградскай вобл. Вучыўся ў Ін-це чырв. прафесуры (1930—32), працаваў выкладчыкам Ваенна-паліт. акадэміі. З 1938 першы сакратар Калінінскага абкома ВКП(б). У 1941—42 чл. Ваен. савета Калінінскага фронту. У выніку баявых узаемадзеянняў калінінскіх і бел. партызанаў у канцы 1942 былі ўтвораны партыз. краі і зоны ў Себежскім, Ідрыцкім, Пустошкінскім, Апочацкім р-нах Калінінскай вобл.; Расонскім, Асвейскім, Дрысенскім р-нах Віцебскай вобл. З 1946 першы сакратар Стаўрапольскага крайкома ВКП(б). У 1956—62 першы нам. старшыні Камісіі парт. кантролю пры ЦК КПСС. На XVIII з'ездзе ВКП(б) выбраны канд. у чл. ЦК, на XIX і XX з'ездах чл. ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—5-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Я. І. Навасельцаў. Калінін.

БАК (Buck) Цім (н. 6.1.1891, Вялікабрытанія), дзеяч рабочага руху Канады. Працаваў слесарам, рабочым у чыг. майстэрнях, майстрам-інструментальшчыкам у розных гарадах Канады, куды эмігрыраваў у 1910, і ЗША. Адзін з арганізатараў Рабочай партыі

Канады (устаноўчы з'езд 1922), перайменаванай у Камуністычную (1924). З 1929 ген. сакратар кампартыі. Пасля забароны яе (1931) арыштаваны і засуджаны на 12 гадоў турмы. Вызвалены ў 1934 пад націскам масавага руху пратэсту. У 1935 выбраны чл. Выканаўчага камітэта Камінтэрна. Са студз. 1962 старшыня кампартыі. Узначальваў дэлегацыі Кампартыі Канады на XX, XXI, XXII, XXIII з'ездах КПСС, на Маскоўскіх нарадах прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый 1957 і 1960, на святкаванні 50-годдзя Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі.

Тв.: Рус. пер.— Наша борьба за Канаду, М., 1961; Народ Канады против монополий, М., 1966; Влияние Великой Октябрьской социалистической революции на канадское рабочее движение, М., 1967.

БАКА (Baka) Юзаф (18.3.1707—2.5.1780), польскі паэт і рэлігійны прапаведнік. Ураджэнец Міншчыны. Займаўся місіянерска-прапаведніцкай дзейнасцю ў Мінску, Навагрудку і Вільні. У творы Б. «Роздумы пра неміпучую смерць», напісаным з рэліг. і маралізатарскімі мэтамі, ёсць многа звестак пра цяжкае становішча сялян. Карыстаўся папулярнасцю на Беларусі і ў Літве ў пач. 19 ст. як гумарыст і збіральнік прыказак.

Літ.: Borowy W. O poezji polskiej w wieku XVIII, Kraków, 1958, c. 66—75; Pyszkowski M. Zagadnienia wiejskie w literaturze polskiego oświecenia, cz. I, Kraków, 1960, c. 18—19.

А. А. Бірала. Мінск.

БАКАВАЯ ЛІНІЯ, сукупнасць спецыялізаваных скурных органаў пачуццяў, характэрных водным назаўсёды. Б. л. маюць кругларотыя, рыбы, лічынкі і некат. дарослыя земнаводныя, якія жывуць у вадзе пастаянна. Размяшчаецца падоўжнымі радамі па бакох цела і складаная сеткай на галаве. З дапамогай Б. л. жывёла адчувае рух вады, скорасць і кірунак плыні, сустрэчныя прадметы і рухі свайго цела.

Найбольш развітыя органы Б. л. ў рыб. Маюць выгляд канальцаў, на дно якіх выходзяць нервовыя канцы. Канальцы злучаюцца з вонкавым асяроддзем шматлікімі адтулінамі, якія прапіваюць слускавінкі. Праз адтуліны ў іх трапляе вада і раздражняе нервовыя канцы. Б. л. ўспрымае таксама і земнаводных органы Б. л. маюць больш простую будову: нервовыя канцы размяшчаюцца ў адкрытых жалабках ці проста ў неглыбокіх ямках.

БАКАЛАЎ Георгі [27.10(7.11).1873, Стара Загора — 14.7.1939], балгарскі публіцыст, крытык і гісторык. Чл.-кар. АН СССР (1932). Вучыўся ў Жэневе (1891—93), там аблізіўся з *групай «Вызваление працы»*. Дэлегат кангрэсаў 2-га Інтэрнацыянала (1897, 1904). Падтрымліваў перасылаць ленінскую «Искру» праз Балгарыю ў Расію. У 1903—05 чл. ЦК Балг. рабочай с.-д. партыі (цесных сацыялістаў), з якой выключаны ў 1905 за анархалібералізм. У 1920 уступіў у БКП (цесных сацыялістаў). Калі ў Балгарыі ўзмацніўся фашысцкі тэрор, эмігрыраваў у СССР (1925—32). Рэдагаваў рэвалюц. перыяд. выданні, склаў рус.-балг. слоўнік, перакладаў творы К. Маркса, Ф. Энгельса, Г. В. Пляханава, М. Горкага. Выступаў супраць дэкадэнцкага мастацтва, садзейнічаў станаўленню сацыяліст. рэалізму ў балг. л-ры. На бел. мову надрукаваны арт. «Рэвалюцыйная літаратура Балгарыі» («Маладняк», 1931, № 2), «Пра самую папулярную з балгарскіх кніг і пра яе аўтара» (у кн. А. Канстанцінава «Бай Ганю», Мн., 1932). Пад рэд. і з уступным артыкулам Б. выйшла кн. М. Марчэўскага, К. Парванава і С. Лілянава «Чотнікі. Апавяданні пра сучасную Балгарыю», Мн., 1932.

Тв.: Избрани произведения, София, 1953.


БАКАПЛАВЫ (Amphipoda), разнаногія ракападобныя, атрад водных ракападобных жывёл. Даўж. 0,5—25 *см*. Цела сагнутае і сплюшчанае з бакоў. 6 пар грудных ног з жабрамі, у самак на другой—пятай парах ног вывадковыя камеры. Тры пары брушных ног служаць для плавання, заднія 3 пары для скакання. Водзяцца Б. ў вадаёмах усяго свету, жывуць як на дне, так і ў тоўшчы вады. Плаваюць на баку. Вядома каля 4500 відаў. Многія Б.— шкоднікі драўніны, ёсць паразіты марскіх жывёл. У БССР 2 віды. Служаць кормам для рыб, таму некаторых Б. акліматызоўваюць у вадасховішчах і азёрах СССР.

БАКАРЫУС Мікалай Сяргеевіч (1869—1931), савецкі судовы медык і крыміналіст, стваральнік айчыннай судовай медыцыны і крыміналістыкі. Па яго ініцыятыве ў 1923 у Харкаве арганізаваны навукова-судовы кабінет; у 1926 рэарганізаваны ў Інстытут судовай экспертызы. З 1926 Б. дырэктар гэтага ін-та. Працы па судовай медыцыне і крыміналістыцы.

Тв.: Судебно-медицинские, микроскопические и микрохимические исследования вещественных доказательств, Харьков, 1910; Наружный осмотр трупа на месте происшествия или обнаружения его, Харьков, 1929; Судебная медицина для медиков и юристов, Харьков, 1930.

БАКАС (Capella gallinago), птушка атрада сеўцападобных. Важыць 100—120 *г*. Апярэнне бурае. Пашыраны ў Зах. Еўропе і на тэр. СССР. На Беларусі звычайная пералётная птушка. Жыве на балотах і прырэчных лугах. Гнёзды робіць на купінах. Нясе 4 яйцы. Корміцца чарвякамі, слімакамі і карэньчыкамі травяністых раслін.

БАКАЧЫО (Boccaccio) Джавані (1313, Парыж — 21.12.1375), італьянскі пісьменнік. З сям'і купца. Дзяцінства прайшло ў Фларэнцыі. У 1332—38 вывучаў права ў Неапалі. Раннія творы — паэмы «Філастрата» (1338, выд. 1480), «Тэсеіда» (1339, выд. 1475), раман «Філакола» (1336—41, выд. 1472) — напісаны пад уплывам арыстакр. неапалітанскай культуры. У пач. 40-х г. вярнуўся ў Фларэнцыю. Быў прыхільнікам рэспублікі, выконваў адказныя дыпламат. даручэнні. Блізкасць да *Дантэ* выявілася ў пастаралі «Амета» (1341, выд. 1478) і паэме «Любоўны прывід» (1342, выд. 1521). Паэма «Ф'езаланскія німфы» (1343—45, выд. 1477), створаная на матывы «Метамарфозаў» Авідзія, абараняе права чалавека на зямное каханне. Значны крок да рэалізму — аповесць «Ф'ямета» (1343—45, выд. 1472). Асн. твор — «Дэкамерон» (нап. 1351—53), сто навел, якія даюць шырокую рэаліст. карціну жыцця Італіі; героі іх узяты з розных сац. колаў — каралі, рыцары, манахі, купцы, сяляне, рамеснікі. З дэмакр. пазіцый Б. выкрываў каталіцкае духавенства і сярэдневяковую ідэалогію аскетызму. Пераемнік Дантэ і *Петраркі*, Б. развіваў італьян. нац. л-ру на нар. мове, даў пачатак італьян. прозе, стварыў класічны тып італьян. рэаліст. навелы. Супярэчнасці сац. развіцця Італіі выклікалі крызіс гуманіст. ідэалаў Б. (алегар. паэма «Крумкач», 1354—55, выд. 1487). У апошнія гады жыцця напісаў працы па гісторыі і міфалогіі, каментарый да «Боскай камедыі» Дантэ і першую біяграфію паэта «Жыццё Дантэ Аліг'еры» (1360—63, выд. 1477). Творчасць Б. адыграла вялікую ролю ў фарміраванні рэалізму ў зах.-еўрап. л-ры 15—16 ст., яго навелы выкарыстоўвалі У. Шэкспір, Лопэ дэ Вэга, Г. Э. Лесінг, І. В. Гётэ і інш.



Маўзалей 26 бакінскіх камісараў. Арх. Г. Алескераў, А. Гусейнаў, скульпт. Н. Зейналаў, Н. Мамедаў. 1968.

Літ.: Джованни Боккаччо. Биобиблиогр. указатель, М., 1961.

БАКЕН, бакан (гал. baken), знак на рацэ (бакен) ці моры (бакан) для абазначэння суднавога ходу (фарватэра) і небяспечных месцаў.

Бакен — металічны паплавок у выглядзе конуса, які прымацоўваецца да якара. Уначы на іх запальваюць ліхтары (электрычныя, на газе, ацэтыленавыя) з пастаянным ці мігатлівым агнём. Асвятляльная апаратура на некаторых Б. уключаецца і выключаецца аўтаматычна з дапамогай фотаэлементаў. У месцах, дзе фарватэр раздвойваецца, ставяць два Б. (белы і чырвоны) ці адзін, пафарбаваны папярочнымі белымі і чырвонымі палоскамі. Там, дзе немагчыма паставіць Б. на плыціну з-за вялікай шырыні ракі, моцных хваляў ці хуткай плыні, ставіцца буй (канічны паплавок, які сваёй формай нагадвае марскі бакан).

БАКІНІЧЫ, неалітычнае паселішча каля в. Бакінічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Адкрыта і даследавалася У. Ф. Ісаенкам у 1965—67. Разам з паселішчам *Камень* — найбольш тыповы помнік культуры грабеньчатай керамікі, пашыранай у вярхоўях Прыпяці і ў Панямонні. Плошча каля 0,6 *га* на ўзгорку ў абалоне р. Бобрык. Пры раскопках ранняга комплексу (5—4-е тысячагоддзі да н. э.) выяўлены груба апрацаваныя каменныя сякеры, цёслы, скрабкі, пласціністыя нажы, разцы, скоблі і абломкі гаршкоў, упрыгожаных косымі лініямі, наколамі, насечкамі, адбіткамі зубчастага штампа. Пры раскопках позняга комплексу (3-е тысячагоддзе да н. э.) знойдзены наканечнікі стрэл, скрабкі і скоблі, нажы на шырокіх адшчэпах, праколкі, сякеры, цёслы, фрагменты посуду з грабеньчата-накольчатым арнаментам. Апошнія знаходкі адносяцца да *нёманскай культуры*.

Літ.: Исаенко В. Ф. Мезолит и неолит Припятского Полесья, у зб.: Древности Белоруссии, Мн., 1966; яго ж. Неолитическая эпоха в Западной части Припятского Полесья, у зб.: Доклады к XI конференции молодых ученых Белорусской ССР, Мн., 1967.

У. Ф. Ісаенка. Мінск.

БАКІНСКІЯ КАМІСАРЫ, рэвалюцыйныя дзеячы Закаўказзя, якія па-геройску загінулі ў 1918: старшыня Бакінскага СНК і камісар па знешніх справах С. *Шаўмян*, нарком па ўнутр. справах П. Джапарыдзе, камісар і нам. наркома ўнутр. спраў М. Азізбекаў, камісар па справах нар. гасп. І. Фіялетаў, камісар працы Я. *Зевін* (парадзіўся ў мяст. Маластоўка Магілёўскай губ.), Р. Карганаў, І. Малыгін, А. Аміран, М. Везіраў, Р. Пятроў, С. Асепян, загадчык рабочай секцыі саўнаргаса М. *Басін* (парадзіўся ў Чэрыкаве Магілёўскай губ.), Б. Авакян, Ф. Сонцаў, А. Кастандзян, А. Бар'ян, І. Метакса, В. Нікалайшвілі, А. Багданаў, С. Багданаў, У. Палухін, Э. Берг, М. Каганаў, І. Габышаў, І. Мішпэ, Т. Аміраў. Пры падтрымцы англ. інтэрвентаў бурж. нацыяналісты і контррэвалюцыянеры — дашнакі, мусаватысты, эсэры і меншавікі — у канцы ліп. 1918 часова задушылі Сав. ўладу ў Баку, арыштавалі і кінулі ў турму Б. к. Бальшавікам удалося вызваліць прыгавораных да расстрэлу Б. к. і даставіць іх на параход «Туркмен», які адыходзіў з Баку. Але контррэвалюц. камандаванне судна ўзяло курс на Краснаводск, дзе панавалі англічане, і перадало Б. к. мясцоваму эсэраўскаму ўраду. Баючыся абурэння мас, англа-эсэраўскія каты досвіткам 20 вер. ўпотай вывезлі 26 камісараў на 207-ю вярсту паміж станцыямі Ахча-Куйма і Перавал і расстралялі. Б. к. сустрэлі смерць словамі: «Мы паміраем за камунізм. Няхай жыве камунізм!». Знявечаныя трупы закапалі ў пясках пустыні. Праз 2 гады астанкі Б. к. перавезены ў Баку і пахаваны на плошчы, якую назвалі Плошчай 26 бакінскіх камісараў. У 1958 на ёй пастаўлены помнік-манумент.

Літ.: Шаумян Л. Двадцать шесть бакинских комиссаров, М., 1968; Бурджанов Э. Двадцать шесть бакинских комиссаров, М., 1938.

Л. М. Лыч. Мінск.

БАКІНСКІЯ СТАЧКІ, масавыя выступленні пралетарыяту Баку ў 1903 і 1904, першыя ўсеагульныя палітычныя выступленні ў Закаўказзі. Праходзілі пад кіраўніцтвам Бакінскага к-та РСДРП. Стачачнікі патрабавалі: устанавіць 8-гадзінны рабочы дзень, вызваліць арыштаваных і прыняць на працу звольненых за ўдзел у дэманстрацыях, павысіць зарплату, палепшыць жыллёвыя ўмовы. Яны падтрымалі паліт. лозунгі бальшавікоў: «Далоў царскі ўрад!», «Далоў вайну!». Размах барацьбы прымусіў гаспадароў пачаць перагаворы. 30.12.1904 заключаны першы ў Расіі калектыўны дагавор рабочых з прадпрыемцамі. Рабочыя дамагліся 9 і пазат 8-гадзіннага рабочага дня, павелічэння заработнай платы, паляпшэння ўмоў працы, быту. Б. с. 1903 і 1904 спрыялі росту паліт. свядомасці закаўказскага пралетарыяту.

БАКІХАНАЎ Абас-Кулі-Ага [псеўд. Гудсі; 21.6(1.7).1794, в. Аміраджан каля Баку — снеж. 1846], азербайджанскі вучоны-асветнік, гісторык і паэт. З сям'і бакінскіх ханаў. Сябраваў з А. Грыбаедавым, А. Бястужавым-Марлінскім, В. Кюхельбекерам, быў знаёмы з А. Пушкіным. Літ. дзейнасць пачаў як паэт. Раннія вершы пісаў пад уплывам эпігона-фарманіст, і рэліг.-міст. паэзіі. У 40-я г.— удзельнік літ. гуртка Мірза Шафі Вазеха ў Тыфлісе. У вершах гэтага перыяду апяваў зямное каханне. «Зварот да Таўрызцаў» — вострая сатыра на іранскіх правіцеляў і дурыяграфіі. У кн. «Райскі кветнік» (апубл. 1926) асвятляе гісторыю Азербайджана ад старажытнасці да пач. 19 ст.

Літ.: Касимзаде Ф. Аббаскули Ага Бакиханов (Гудси). Жизнь и творчество, [пер. з азерб.], Баку, 1958; Современники о Бакиханове, Баку, 1959.

Н. Мамедаў. Баку.

БАКЛАЖАН (Solanum melongena), аднагадовая травяністая агародная культура сямейства паслёнавых. Паўраскідзістая расліна выш. 50—70 *см*, з фіялетавымі ці белымі кветкамі. Плады грушападобныя, яйцападобныя і інш., часцей фіялетавыя з зеленаватай ці белай мякаццю; маюць цукар, вітаміны B_2 і PP, солі фосфару, кальцыю, жалеза і інш. рэчывы. Плады спажываюць недаспелыя (смажаць, тушаць, кансервуюць). Б. патрабавальны да цяпла і вільгаці. Радзіма яго — Усх. Індыя. Культывуецца ў трапічных і субтрапічных паясах; у СССР — у сярэдняй палосе і на Пд Еўрап. часткі. На Беларусі акліматызаваны скараспелыя сарты Далікатэс 163 і Майкопскі 15 (вырошчваецца расадаў торфаперагнойных кубіках ці гаршчочэрвеня); ураджайнасць 100—150 *ц/га*.



Баклажан Далікатэс 163.

БАКЛАНАЎ Міхаіл Іванавіч [н. 30.1(12.2). 1914, с. Іванаўка Марыупальскага пав. Екацярынаслаўскай губ.], беларускі савецкі архітэктар. Засл. арх. БССР (1969). З 1944 працуе ў «Белдзяржпраекце». Асн. работы ў Мінску: Дзярж. рускі драм. т-р БССР (1948—50), арх.-буд. тэхнікум (1954), Дзярж. маст. музей БССР (1957), навуч. карпусы Ін-та механізацыі с. гасп. (1960), мед. ін-та (1966), Бел. дзярж. ун-та (корпус радыёфізікі, 1966, з Н. Дзяменцьевай), а таксама гал. корпус турысцкай базы (пачата ў 1968) на воз. Нарач. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

БАКЛАНЫ (Phalacrocoracidae), сямейства птушак атрада весланогіх. Даўж. да 90 *см*, маса да 3 *кг*. Апярэнне чорнае. Усе 4 пальцы злучаны плавальнай перапонкай. У СССР пашыраны прадстаўнікі падсям. ўласна Б. роду сапраўдных Б., які ўключае 29 відаў. Жывуць на марскіх узбярэжжах, астравах, вялікіх унутраных вадаёмах. Кормяцца рыбай. Вельмі пражэрлівыя. Гняздуюцца калоніямі. Шкодзяць рыбнай гаспадарцы. На Беларусі (у паўд. раёнах) адзін від — вялікі баклан.



Вялікі баклан.

БАКСАЎ Аляксей Іванавіч [н. 10(23).11. 1907, Вялікая Камышынка Аткарскага пав. Саратаўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1928. У Чырв. Арміі з 1926. У Айч. вайну ген.-маёр Б. камандаваў дывізіяй. Вызначыўся ў баях па ПнЗ ад Віцебска. Дывізія прарвала абарону ворага на ўчастку в. Забор'е — Арэхі, фарсіравала Зах. Дзвіну, перасекла дарогу Лепель — Полацк, чыг. Полацк — Маладзечна, з баямі прайшла 164 *км*, вызваліла 253 населеныя пункты Беларусі. Служыць у Сав. Арміі.

БАКСІТ (франц. beauxite ад мясцовасці Beaux у Францыі), тонкадысперсная горная парода, якая складаецца з гідратаў вокіслаў алюмінію (30—80%) і вокіслаў жалеза (да 30% і больш) з прымесямі крамянязёму (да 10% і больш) і інш. Ёсць Б. монагідратныя (*дыяспор*, бёміт), трыгідратныя (*гідрагіліт*), часцей мяшаныя.

Парода шчыльная, радзей мяккая, камяністая ці глінападобная, порыстая, ад белага да ружавага колеру, бабовай, аалітавай або зямлістай тэкстуры. Цв. да 6; шчыльн. 2900—3500 *кг/м*³. Паходжанне элювіяльнае (латэрытнае выветрыванне, растварэнне вапнякоў) і асадкавае (прыбярэжна-марскія, лагунныя і азёрныя Б.). Найважнейшая руда для вытв. алюмінію, электракарунду, вогнетрывалых матэрыялаў і інш. Радовішчы ў СССР, на Ямайцы, у Гаяне, Гане, Францыі, Венгрыі і інш.

БАКТЭРЫІ (грэч. bactērion палачка), мікраскапічныя, пераважна аднаклетачныя раслінныя арганізмы. Маюць форму шара (кокі), палачкі, спіралі (ад выгнутай палачкі — вібрыёна — да доўгай спіралі з вялікай колькасцю завіткоў — спірылы, спірахеты); ёсць нітчастыя формы. Укрыты клетачнай абалонкай (200—600 Å), цытаплазматычнай мембранай (50—300 Å) і запоўнены цытаплазмай. Пры вывучэнні ўнутранай будовы бактэрыяльнай клеткі на ультратонкіх зрэзах з дапамогай электроннага мікраскопа выяўлена, што цытаплазма клеткі Б. мае слаістую, грануляваную, трубчастую структуру. Клетка мае ядравае рэчыва ДНК і багатыя на РНК рыбасомы (арганоіды, дзе адбываецца сінтэз бялкоў).



Бактэрыі (мікрафатаграфіі): 1. Кокі. 2. Палачкападобныя бактэрыі. 3. Вібрыёны. 4. Спірылы. 5. Споры (размешчаныя на канцах клетак). 6. Споры (цэнтральнае размяшчэнне). 7. Бактэрыі з вялікай колькасцю жгуцікаў. 8. Бактэрыі з адным жгуцікам.

Перамяшчаюцца Б. з дапамогай жгуцікаў (нітканадобных утварэнняў пратэінавага саставу) або актыўным скарачэннем; многія віды нерухомыя. Жывяцца як сапрафіты — рознымі арган. рэшткамі (гніласныя, воцатнакіслыя, маслянакіслыя Б.) або як паразіты (гл. *Паразітызм*); некаторыя могуць утвараць арган. рэчывы з неарганічных (гл. *Азотфіксавальныя бактэрыі*). Паводле тыпу дыхання Б. падзяляюць на строгія *аэробы*, мікрааэрафілы (развіваюцца пры паніжаным парцыяльным ціску кіслароду), факультатыўныя анаэробы (выкарыстоўваюць свабодны кісларод паветра, але растуць і ў бескіслародным асяроддзі) і аблігатныя анаэробы (гінуць пры наяўнасці кіслароду). У працэсе росту Б. выдзяляюць у асяроддзе многа ферментаў. Размнажаюцца папярочным дзяленнем, якое адбываецца праз 15—30 *мін*, радзей пачкаваннем. Некат. віды ўтвараюць ахоўныя структуры: капсулі ў арганізме і споры ў вонкавым асяроддзі (гл. *Бацылы*). Зменлівасць, здольнасць да адаптацыі, устойлівасць да шкоднага ўплыву ў Б. больш высокая, чым у інш. арганізмаў. Асн. групы Б.: сапраўдныя, актынаміцэты, спірахеты, міксабактэрыі, хламідабактэрыі, мікаплазмы.

Б. ёсць у глебе, вадзе, паветры, у арганізмах чалавека і жывёл. Вялікая роля іх у кругазвароце рэчываў у прыродзе, папаўненні запасаў вуглекіслаты ў атмасферы і мінер. азоту ў глебе, неабходных для жыўлення раслін. Дзейнасць некаторых Б. выкарыстоўваецца для атрымання антыбіётыкаў, ферментаў, вітамінаў, спіртоў, арган. кіслот, ацэтону, кісламалочных прадуктаў, у сіласаванні кармоў, квашанні агародніны і інш. Другія ж Б. псуюць харч. прадукты, паперу, водаправодныя трубы. Многія выклікаюць хваробы чалавека (туберкулёз, брушны тыф, дызентэрыю), жывёл (сап, сібірскую язву), раслін (мокрую гніль бульбы і інш.). Некаторыя хваробныя Б. і іх таксіны (ядавітыя рэчывы) выкарыстоўваюцца для прыгатавання вакцын і атрымання лекавых сываратак. Гл. таксама *Бактэрыялогія*.

Літ.: Иерусалимский Н. Д. Основы физиологии микробов, М., 1963; Красильников Н. А. Определитель бактерий и актиномицетов, М.— Л., 1949; Пешков М. А. Сравнительная цитология сине-зеленых водорослей, бактерий и актиномицетов, М., 1966; Хэйс У. Генетика бактерий и бактериофагов, пер. с англ., М., 1965; Месробяну Л. и Пэунеску Э. Физиология бактерий, пер. с рум., Бухарест, 1963. Гл. таксама літ. да арт. *Мікраарганізмы*.

А. П. Красільнікаў. Мінск.

БАКТЭРЫЯЛАГІЧНАЯ ЗБРОЯ, сродак масавага заражэння людзей, с.-г. жывёл і раслін. Гл. *Біялагічная зброя*.

БАКТЭРЫЯЛІЗІНЫ (грэч. bactērion палачка+lysis растварэнне, разбурэнне), антыцелы, якія садзейнічаюць растварэнню клетак бактэрый.

Растваряюцца бактэрыі пры наяўнасці двух антымікробных фактараў: спецыфічнага — антыцела, якое ёсць у імуннай сываратцы, і неспецыфічнага — камплемента імуннай і нармальнай сываратак. Б. выдзяляюцца жывёльнымі арганізмамі і многімі бактэрыямі, напр. сінягнойная палачка выдзяляе Б., які растварае бактэрыі сібірскай язвы, брушнога тыфу, дыфтэрыі. Гл. таксама *Імунітэт*.

БАКТЭРЫЯЛОГІЯ (грэч. bactērion палачка+*...логія*), навука пра *бактэрыі*. Узнікла ў 2-й пал. 19 ст., калі Л. Пастэр даказаў, што інфекцыйныя хваробы і браджэнне выклікаюцца бактэрыямі. Вялікі ўклад у развіццё Б. рус. і сав. вучоных: азотфіксавальныя і цэлюлозныя бактэрыі даследаваў В. Л. Амялянскі; патагенныя — І. І. Мечнікаў, Д. К. Забалотны, Л. А. Тарасевіч, М. Ф. Гамалея; *хемасінтэз* у бактэрый адкрыў С. М. Вінаградскі. Асн. метады даследаванняў у Б.: бактэрыяскапічны — выяўленне бактэрый з дапамогай мікраскопа; бактэрыялагічны — даследаванне чыстай культуры бактэрый на спецыяльным пажыўным асяроддзі; эксперыментальны — заражэнне лабараторных жывёл пэўнай хваробай; сералагічны — вызначэнне антыгенаў бактэрый і антыцелаў супраць іх у сываратцы чалавека і жывёл; алергічны — вывучэнне павышанай адчувальнасці чалавека і жывёл да бактэрый і прадуктаў іх распаду. Б.— раздзел *мікрабіялогіі*.

Літ.: Многотомное руководство по микробиологии, клинике и эпидемиологии инфекционных болезней, т. 4, М., 1964. *А. П. Красільнікаў.* Мінск.

БАКТЭРЫЯЛЬНЫЯ ЎГНАЕННІ, угнаенні, якія змяшчаюць у сабе культуры мікраарганізмаў, карысных для с.-г. раслін. Абагачаюць глебу лёгка засваяльнымі рэчывамі, павышаюць устойлівасць раслін да грыбных і бактэрыяльных хвароб. Выкарыстоўваюцца 4 віды Б. у.: нітрагін, азотабактэрын, фосфарабактэрын, АМБ.

Нітрагін, культура клубеньчыкавых бактэрый. Паляпшае азотнае жыўленне бабовых раслін. Бактэрызацыю насення робяць перад сяўбой. Нітрагін бываюць з тымі клубеньчыкавымі бактэрыямі, якія патрэбны пэўным культурам. Глебавы прэпарат нітрагіну выпускаецца порцыямі, разлічанымі на 1 *га*; 1—2 бутэлькі прэпарату дастатковa для бактэрызацыі насення бабовых культур на 1 *га*. Азотабактэрын мае ў сабе культуру азотабактэру. Абагачае глебу лёгказасваяльнымі формамі азоту, вітамінамі і інш. біялагічна актыўнымі рэчывамі. Азотабактэрынам апрацоўваюць насенне збожжавых культур і бураковў перад сяўбой, клубні бульбы і расаду перад высаджваннем у грунт, дадаюць у кампосты і ў органа-мінер. сумесі. Фосфарабактэрын мае бактэрыі, ад дзеяння якіх фосфар арган. злучэнняў глебы пераходзіць у мінер. форму і засвойваецца

раслінамі. Рэкамендуецца для кіслых падзолістых глебаў пасля вапнавання іх і ўнясення арган. угнаенняў. АМБ (*аўтахтонная мікрафлора* групы Б), комплекснае ўгнаенне. Маё розныя групы мікраарганізмаў, прадукты жыццядзейнасці якіх неабходны для карапёвага жыўлення раслін. Каб прыгатаваць АМБ, на 1 *т* нізінага торфу даюць 1 *ц* вапнавых матэрыялаў, 1 *кг* матачнай культуры АМБ. Прав 3 тыдні масу можна вывозіць на поле (250—500 *кг/га*).

Літ.: Дорошинский Л. М. Бактериальные удобрения — дополнительное средство повышения урожая, М., 1965; Справочник по удобрениям, Мн., 1969.

Ф. П. Вавула. Мінск.

БАКТЭРЫЯЛЬНЫЯ ХВАРОБЫ РАСЛІН, парушэнні нармальнага фізіялагічнага стану і развіцця раслін, выкліканыя бактэрыямі. Пашкоджваюцца вегетатыўныя органы расліны і плады ў час росту і хавання. Распаўсюджваюцца Б. х. р. праз насенне, вусціцы, нектарнікі, вадзяную пару, раштамі хворых раслін, паліўной і дажджавой вадою, пры доглядзе раслін. Шкодзяць бавоўніку, таматам, бульбе, капусце і інш. Адрозніваюць: *гнілі* — тканкі і органы раслін мякнуць, робяцца друзлыя і распадаюцца; *плямістасці сельскагаспадарчых раслін* — клеткі, пашкоджаныя бактэрыямі, адміраюць, утвараюцца жоўта-бурыя плямы, якія часта выпадаюць; *апёкі* — кветкі, завязь, лісце і парасткі бурэюць і чарнеюць; *завядзянне* — бактэрыі запаўняюць сасуды расліны, ад чаго гінуць маладыя галінкі або ўся расліна; пухліны — на каранях, галінах, сцяблах утвараецца ўздуцце, абкружанае наплывам (гл. *Галы, Калус*); камедзецячэнне слівы, вішні, персіка і інш. Меры барацьбы: дэзінфекцыя насення (гл. *Пратравы*), саджанцаў і чаранкоў, глебы ў парніках і цяплiцах (гл. *Цяплічна-парніковая гаспадарка*); апырсквание або апыльванне хворых раслін і іх раштаў; абрэзка хворых парастка ў і дэзінфекцыя пашкоджаных мясцін; правільны севазварот; нармальны рэжым жыўлення і водазабеспячэння раслін. Б. х. р. даследавалі сав. вучоныя В. П. Ізраільскі, Р. М. Галачʼян, М. У. Горленка, К. І. Бельцюкова і інш.

Літ.: Бактериальные болезни растений, 2 изд., М., 1960; Горленко М. В. Бактериальные болезни растений, 3 изд., М., 1966; Болезни сельскохозяйственных культур БССР, Мн., 1958.

А. А. Сапагова. Мінск.

БАКТЭРЫЯФАГ (грэч. bactērion палачка+phagós пажыральнік), фаг, бактэрыяльны вірус, ультрамікраскапічны агент, здольны растварацъ мікраарганізмы (пераважна бактэрыі і актынаміцэты).



Схема будовы бактэрыяфага.

Упершыню з'яву бактэрыяфагіі апісаў рус. вучоны М. Ф. Гамалея (1898). Б. ёсць у глебе, вадаёмах, арганізмах жывёл і чалавека. Маё ўласцівасці вірусаў. В. спецыфічны: растварае толькі блізкія па роднасці мікраарганізмы. Устойлівы да шкоднага ўплыву вонкавага асяроддзя. Электроннаскапічным метадам на ультратонкіх зрэзах вызначана, што фаг вельмі малых памераў (тысячныя долі *мкм*), мае форму барабаннай палачкі — складаецца з галоўкі і адростка. У многіх на канцы адростка ёсць расшырэнне, ад якога адыходзяць ніці — органы адсорбцыі. На В. белковая абалонка, усярэдзіне нуклеінавыя к-ты (ДНК і РНК). Прыкрываюцца да бактэрыі, фаг укручвае ў яе спіральную малекулу ДНК, якая вельмі хутка раскручваецца і разыходзіцца на дзве часткі. Кожная з іх дабудоўвае другую за кошт запасаў інфікаванай клеткі: з адной малекулы ДНК утвараюцца дзве і г. д. Бялковая абалонка фага будуецца пад уплывам РНК з амінакіслот гэтай самай клеткі.

Б. выкарыстоўваюцца ў медыцыне, ветэрынарыі пры лячэнні, прафілактыцы і дыягностыцы хвароб, асабліва кішачных (дызентэрыі, брушнога тыфу), пры вытворчасці антыбіётыкаў і інш. Іншы раз Б.— небяспечны шкоднік мікрабіялагічнай вытворчасці

Літ.: Кривицкий А. С. Вирусы против микробов (Бактериофагия), М., 1962; Адамс М. Бактериофаги, пер. с англ., М., 1961.


Р. У. Тузава. Мінск.

БАКУ (азерб. Бакы), сталіца (з 1920), прамысловы і культурны цэнтр Азербайджанскай ССР, на зах. узбярэжжы Каспійскага м., на Пд Апшэронскага п-ва. Займае паўд. схілы Бакінскага плато, якое амфітэатрам акружае падковападобную бухту. Вялікі чыг. вузел і важны марскі порт. Аэрапорт. 1261 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1970).

Упершыню ўпамінаецца як горад у арабскіх географаў 9—10 ст. Ужо тады ў Б. здабывалі нафту. З 2-й пал. 12 ст. значны порт, рэзідэнцыя шырваншахаў. Збераглiся ў крэпасці Ічэры-Шэхер мінарэт Сыныk-кала (1078—79, выш. 22,5 *м*), Дзявочая вежа (Кыз-каласы, 12 ст., выш. 28 *м*); ансамбль палаца шырваншахаў 15 ст. (палац Дыван-ханэ, пахавальня, маўзалей Сеіда Яхʼя Бакуві, Усходнія вароты, аўдан, лазня). У 16 ст. горад захапіла Турцыя, у пач. 17 — Іран. З 1747 цэнтр Бакінскага ханства. Да Расіі далучаны ў 1806. Забудова па-за сценамі крэпасці пачалася пасля 1810, хуткі рост горада — з 70-х г. 19 ст. У 1901 раён Б. даваў каля 50% сусв. здабычы і 95% здабычы нафты ў Расіі. У нафтавай прамысл. вялікая роля належала замежнаму капіталу. Першыя с.-д. гурткі ўзніклі ў 1898—99. У пач. 20 ст. адбыліся масавыя выступленні пралетарыяту, які налічваў каля 60 тыс. чал. У 1901 утвораны Бакінскі к-т РСДРП, у 1905 Бакінскі Савет рабочых дэпутатаў. У бальшавіцкай арг-цыі Б. працавалі Р. К. Ардзанікідзе, С. С. Спандаран, І. В. Сталін, С. Г. Шаўмян. 31.10(13.11).1917 устаноўлена Савецкая ўлада. 25.4.1918 утвораны Бакінскі СНК. 31.7.1918 уладу захапіў контррэвалюц. ўрад «Дыктатура Цэнтракаспія», 15.9.1918 — мусаватысты. У ноч на 28.4.1920 пралетарыят Б. пры падтрымцы чырв. Арміі скінуў мусаватысцкі ўрад; Азербайджан быў абвешчаны Сав. рэспублікай.

Б.— буйны цэнтр раёна нафтаздабычы. Нафтапровад Б.— Батумі (1200 *км*), газаправод Карадаг — Б.— Ерэван (каля 700 *км*). Машынабудаванне (вытв. абсталявання для нафтавых промыслаў і нафтаперагонных з-даў, электраматоры, трансфарматары і інш.), суднабудаванне, судна-, вагона- і аўтарамонтныя з-ды. Газ. і хім. прамысл. (вытв. сернай к-ты, каўстычнай соды, кісларoду, ацэтылену і інш.), цэментная, буд. матэрыялаў (азбашыферны і домабудаўнічы камбінаты, гута, завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый). Лёгкая і харч. прамысл. (баваўняны, камвольны, тонкасуконны, трыкатажны камбінаты; швейная і абутковая ф-кі; мясакамбінат, хлебазаводы; макаронная, тытунёвая, чайная ф-кі). 4 ЦЭС аб'яднаны ў энергасістэму з Мінгечаурскай ГЭС. Электрыфікаваная чыгунка злучае горад з нафтапромысламі. У грузабароце Б. пераважаюць нафта і нафтапрадукты, нафтавае абсталяванне, збожжа, рыс, садавіна, рыба, мінер. ўгнаенні, машыны. У Б. метрапалітэн (з 1967).

Паводле ген. плана (распрацоўку пачаў у 1923 В. Вяснін) былі рэканструяваны старыя раёны, створаны вял. плошчы: Дома ўрада, Нізамі. Узніклі новыя раёны: Нагорнае



Баку. Праспект Кірава.

плато і пасёлкі Мамед'ярава і Монціна з комплекснай забудовай. Пабудаваны Дом урада (1952, арх. Л. Рудневў і У. Мунц), публічная б-ка імя Ахундава (1960, арх. М. Усейнаў), музей У. І. Леніна (1960, арх. Г. Меджыдаў). Помнікі У. І. Леніну (1957, скульптар П. Сабсай), Нізамі (1949, скульптар Ф. Абдурахманаў), 26 бакінскім камісарам (1958, скульптар С. Мяркураў), манумент «Вызваленне» (1960, скульптар Абдурахманаў, арх. Усейнаў), помнік Фізулі (1962, скульптары О. Эльдараў, Т. Мамедаў).

У 1967/68 навуч. г. ў горадзе было: 262 агульнаадук. школы ўсіх відаў, 113 школ рабочай моладзі, 28 сярэдніх спец. навуч. устаноў, 10 ВНУ: Азерб. ун-т імя Кірава, ін-ты нафты і хіміі імя Азізбекава, політэхнічны, пед. імя Леніна, мед., нар. гаспадаркі, фіз. культуры, тэатральны і інш. У Б. працуюць (1968) АН Азерб. ССР, 83 НДІ і інш. навук. ўстановы, 104 клубы, Палацы і Дамы культуры, 153 б-кі, 16 кінатэатраў, 14 музеяў, 8 т-раў (оперы і балета імя Ахундава, рус. драмы імя Вургуна, азерб. драматычны імя Азізбекава, муз. камедыі, юнага гледача і інш.), ансамбль «Азербайджан», філармонія. Гарадская газ. «Баку» (на азерб. і рус. мовах). У 1967 у Б. было 86 бальнічных устаноў на 16 091 ложак, 98 паліклінік і амбулаторый, 7779 урачоў усіх спецыяльнасцей, 14 295 чал. сярэдняга мед. персаналу.

Помнік Фізулі. 1962. Фрагмент.



Літ.: Ашурбейли С. Б. Баку XVI—XVII вв. по описаниям путешественников, «Известия АН Азерб. ССР», 1947, № 1; Советский Азербайджан, Баку, 1958; Кавиев М. А. Из истории революционной борьбы бакинского пролетариата (1905—1910 гг.), Баку, 1956; Азербайджан (Исторические и достопримечательные места), Баку, 1960.

БАКУНЕЦ (па мужу Колбік) Ніна Фёдараўна (н. 3.1.1945, в. Туры Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). З 1960 працуе ў калгасе «17 верасня» Столінскага р-на, з 1961 свінарка гэтага калгаса.

БАКУНІН Міхаіл Аляксандравіч [18(30).5.1814, Наваторжскі павет Цвярской губ.— 19.6(1.7).1876], рускі дробнабуржуазны рэвалюцыянер, адзін з заснавальнікаў і тэарэтыкаў анархізму. П. ў багатай памешчыцкай сям'і; атрымаў ваен. адукацыю. У 1840 выехаў за мяжу. Актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыях 1848—49 у Еўропе, за што саксонскім судом прыгаворан да пакарання смерцю. У 1851 аўстр. ўрад выдаў Б. рускім уладам. Адбываў пакаранне ў Петрапаўлаўскай і Шлісельбургскай крэпасцях, ссылку ў Зах. Сібіры, адкуль у 1861 уцёк за мяжу. У Лондане супрацоўнічаў з А. Герцэнам і М. Агаровым у «Колоколе». У 1868 арганізаваў «Міжнародны альянс сацыялістычнай дэмакратыі», уступіў у 1-ы Інтэрнацыянал, з якога выключаны (1872) за раскольніцкую дзейнасць. Анархісцкія погляды Б. канчаткова склаліся к канцу 60-х г. Выступаў супраць марксізма, адмаўляў паліт. барацьбу рабочага класа, неабходнасць дзяржавы і дыктатуры пралетарыяту. К. Маркс і Ф. Энгельс рэзка крытыкавалі погляды Б. і выкрылі іх шкоднасць для рэвалюц. руху. У аграрных дзяржавах, дзе асн. паліт. сілай з'яўлялася сялянства, бакунізм успрымаўся як бунтарства, як сродак барацьбы сялянскіх мас за сваё вызваленне. У Расіі бакунізм — адна з асн. плыняў рэвалюц. народніцтва.



Тв.: Собр. соч. и писем, т. 1—4, М., 1934—35.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Мнимые расколы в Интернационале, Соч., т. 18; іх жа. Альянс социалистической демократии и Международное товарищество рабочих, там жа; Энгельс Ф. Бакунисты за работой, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 18; Ленін У. І. Анархізм і сацыялізм, Тв., т. 5 (Поли. собр. соч., т. 5); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (Поли. собр. соч., т. 33).

БАКУНЦ Аксел [сапр. Тэвасян Аляксандр Сцяпанавіч; 13(25).6.1899, г. Гарыс — 1937], армянскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1925. З сялян. Вучыўся ў Эчміядзінскай духоўнай акадэміі. У 1923 скончыў Харкаўскі

с.-г. ін-т. Працаваў гал. аграномам Зангезурскага пав. Друкавацца пачаў у 1913. Першы зб. аповесцей і апавяданняў «Цёмная цясніна» (1927) пра жыццё арм. сялянства. У зб. навел «Сейбіты чорных палёў» (1933) перадаў напружаную атмасферу рэвалюц. барацьбы ў Арменіі, паказаў фарміраванне свядомасці і рэвалюц. светапогляду новага чалавека. Апавяданням Б. ўласцівыя тонкасць псіхалаг. малюнка, паэтычнасць вобразаў простых людзей, дакладнасць у абмалёўцы побыту. Аповесці «Аўнатан Марч» (1927), «Кіярэс» (1935) мелі вялікае значэнне для развіцця арм. сатыры. Аўтар даследавання (1932) пра Х. Абавяна, нясканчаных раманаў «Хачатур Абавян» і «Кармракар».

Тв.: Бел. пер.— у зб.: Кветкі Арарата, Мн., 1964; рус. пер.— Рассказы, Ереван, 1956; Повести и рассказы, М., 1962.

Літ.: Агабабян С. Аксель Бакунц, М., 1965.

БАКУНЫ, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны партызан». За 18 *км* на ПнЗ ад Пружан, 110 *км* ад Брэста, 32 *км* ад чыг. ст. Аранчыцы. 423 ж., двароў 144 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. У часы бурж. Польшчы ў Б. дзейнічалі падпольныя ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ. Помнік сав. воінам, партызанам і аднавяскоўцам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАКУНЫ, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр Ткачоўскага с/с і калгаса імя Чапаева. За 2 *км* ад канала Вінец (бас. Ясельды), 22 *км* на Пд ад Пружан, 85 *км* ад Брэста, 10 *км* ад чыг. ст. Аранчыцы. 260 ж., двароў 79 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У часы бурж. Польшчы ў Б. дзейнічалі падпольныя ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ.

БАКШАЙ Іосіф Іосіфавіч [н. 20.9(2.10).1891, сяло Кабылецкая Паляна ў Закарпацці], украінскі савецкі мастак і педагог. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. Акад. маст. СССР (1958). Вучыўся ў Акад. выяўл. мастацтваў у Будапешце (1910—14). Упершыню на Закарпацці заснаваў маст. школу (з А. Эрдэлі). Майстар пейзажа: «Ужгарадскі замак» (1931), «Возера ў гарах» (1946), «Горнае возера Балатул» (1955), «Сінявірскія паляніны» (1967).

Літ.: Курильцева В. Бокшай Иосиф Иосифович, М., 1962.

БАКШАНСКІ Юльян (1824 — 4.4.1863), удзельнік вызваленчага руху і паўстання 1863 на Беларусі і ў Літве. З сям'і небагатага шляхціца. Вучыўся ў Віленскай гімназіі. У 1842 за хаванне забароненых кніг быў сасланы ў Разанскую губ. Вярнуўшыся з выгнання, у 1847 зрабіў спробу падняць паўстанне смаргонскіх сялян. Звярнуўся да іх з адобеднатой і салдатамі і выступіць супраць паўдаўся. Б. быў арыштаваны і засуджаны на 12 гадоў катаргі. У 1863 арганізаваў і ўзначаліў атрад паўстанцаў і ў сутычцы з урадавымі войскамі на Віленшчыне загінуў.

Літ.: Чепко В. В. Общественно-политическое движение в Белоруссии в 40-е гг. XIX в., у кн.: Труды Института истории АН БССР, в. 3, Мн., 1958; Смирнов А. Ф. Революционные связи народов России и Польши. 30—60-е годы XIX в., М., 1962, с. 125—127; Fajnhauz D. Rok 1846 na ziemiach Litwy i Białorusi Zachodniej, «Przegląd historyczny», 1957, t. 48, zesz. 4, s. 683—706.


Н. І. Махнач.

БАКШТЫ, вёска ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Бярэзіна (прыток Нёмана). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Ульянава. За 40 *км* на У ад гар. пас. Іўе, 187 *км* ад Гродна, 25 *км* ад чыг. ст. Юрацішкі. Аўтобусная ст. 1257 ж., гасп. 382 (1970). З-д на вытв. смалы, лесаўчастак, вытв. дахавых і тарных матэрыялаў, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, клуб, бальніца, амбулаторыя, аптэка, вет. пункт, дзіцячы сад-яслі, 2 сталовыя. У часы бурж. Польшчы дзейнічала падпольная ячэйка КПЗБ. Жыхары Б. нораз выступалі супраць памешчыкаў і бурж. ўрада. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАКШТЫ, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл., каля вытоку р. Нявіша. Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 38 *км* на Пн ад Шчучына, 67 *км* ад Гродна, 24 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 426 ж., гасп. 131 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, майстэрні камбіната быт. абслугоўвання. Каля Б. ва ўрочышчы Мілёва знаходзіцца стаянка неаліту і бронзавага веку. На хутары Пясчына (1 *км* ад Б.) у 1876 нарадзілася бел. паэтэса *Цётка*.

БАКШЭЕЎ Васіль Мікалаевіч [12(24).12.1862, Масква — 28.9.1958], рускі савецкі мастак. Нар. мастак СССР (1956), правадз. чл. Акадэміі мастацтваў СССР (1947). Вучыўся ў Маскоўскім вуч. жывапісу, ваяння і дойлідства (1878—88) у У. Макоўскага, В. Пярова, В. Паленава. Быў чл. Т-ва перасоўных маст. выставак (з 1893) і Асацыяцыі мастакоў рэвалюц. Расіі (з 1922). У традыцыях рус. рэаліст. жывапісу стварыў шэраг жанравых карцін («Дзяўчына корміць галубоў», 1887; «Проза жыцця», 1892—93, і інш.) і лірычных пейзажаў, у якіх выкарыстаў матывы, характэрныя сярэднерускай прыродзе («Блакітная вясна», 1930; «Вясна прыйшла», 1943). У

В. М. Бакшэеў.
На параду. 1892. Дзярж. маст. музей БССР.



Дзярж. маст. музеі БССР: «На параду», 1892; «Вечар ранняй вясны», 1918; «Сцежка», 1938, і інш. Дзярж. прэмія СССР 1943.

Літ.: Абрамова А. В. Василий Николаевич Бакшеев, М., 1967.

БАЛАБАВА Аляксандра Кірылаўна (н. 23.4.1928, в Калінаўка Горацкага р-на Аршанскай акругі), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1967. З 1944 працуе ў калгасе імя Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл., з 1951 звянявая на вырошчванні лёну.

БАЛАГАН (ад перс. балахане — верхні паверх, балкон), у 18 — пач. 20 ст. часовы будынак для тэатральных, цыркавых або эстрадных паказаў на кірмашах, народных гуляннях. Вядомы ў Расіі з сярэдзіны 18 ст., на Беларусі з 19 ст. У Б. выступалі ралёшнікі, сілачы, балаганныя дяды, акрабаты, нар. хоры, лялечнікі, штукары; ставіліся фарсы, арлекінады, нар. драмы, часам псеўданатрыятычныя п'есы. У Б. пачалі свой шлях А. Л. і У. Л. Дуравы, І. С. Радунскі (Бім) і інш. Гл. таксама *Кірмашовы тэатр*.

БАЛАДА (праванс. ballada, ад лац. ballo танцую), 1) у фальклоры — песня ліра-эпічнага характару з драматычна напружаным сюжэтам. Баладныя песні вельмі пашыраны на Беларусі, у сялянскім быце выконваюцца пераважна як беседныя.

Значная частка належыць да каляндарна-земляробчага цыклу (Б. веснавыя, юраўскія, купальскія, восеньскія, піліпаўскія і інш.). У некаторых сюжэтах слады старажытнага светапогляду (матывы паабегнутага кроваразмяшэння, закляцця, метамарфоз і інш.). Пазней нараджаюцца сюжэты, звязаныя з тэмай насільнага шлюбу, варожасці мужавай сям'і да нявесткі. Тыповыя для беседных Б. сюжэты пра змеяборца Юр'я, сястру і дзевяць братоў-разбойнікаў, патанулага чарнаморца, малойца, забітага апоўначы ў лесе пярунom (рэкруцкая), пра нявернасць жонкі мужу-воіну, саперніцтва ў каханні двух братоў, смерць далёка ад роднага дому, вяртанне дадому не пазнаных жанчынай мужа ці сына (салдацкія). Гістарычныя паводле зместу Б. адлюстроўваюць падзеі тат. нашэсця (тэма сустрэчы маці з дачкою ў тат. палоне), казацка-сялянскіх паўстанняў 16—18 ст. (Б. пра Вандарофку), Айч. вайны 1812 (Б. пра асаду Смаленска). Б., звязаныя з земляробчым календаром, выконваюцца дзяўчатамі і жанчынамі на традыцыйныя ў пэўнай мясцовасці напевы групавога прымацавання (групе тэкстаў Б. адной каляндарнай функцыі аднавядае тыпавы напеў-формула). Напевы некантрастныя, пераважаюць малаад'ёмныя гукарады. Большасць некаляндарных Б. (тых, што пяюцца «абы-калі») належыць у адналькавай ступені мужчынскаму і жаночаму рэпертуару, напевы індывідуальна замацаваны за пэўным тэкстам, насычаны элементамі ладава-інтанацыйнай, рытмічнай, фактурнай, тэмбрава-дынамічнай кантрастнасці. Баладныя сюжэты ёсць і ў гарадскіх песнях-рамансах, у трагічных песнях пра лёс рэвалюцыянераў. У паслярэвалюц. час Б. сустракаюцца сярод песень грамадз. вайны, рэвалюц. падполля ў Зах. Беларусі, Вял. Айч. вайны. Многія прысвечаны гістар. асобам (К. С. Заслонаву, М. Ф. Сільніцкаму, З. А. Касмадзям'янскай). Напевы Б. на сучасную патрыят. тэматыку набліжаюцца да сав. масавай песні.

Публ.: Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 1, СПб., 1887; Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник, ч. 4, М., 1903; Беларускія народныя песні. Запіс Р. Шырмы, т. 1, 3, Мн., 1959—62; Weryho W. Dumki białoruskie ze wsi Głębokiego..., Kraków, 1889; Federowski M. Lud białoruski, t. 5, Warszawa, 1958.

Л. С. Мухарынская. Мінск.

2) У літаратуры — невялікі сюжэтны ліра-эпічны твор казачна-фантастычнага, легендарна-гістарычнага ці гераічнага зместу.

Паходжаннем звязана з фальклорам. Гераіка-фантаст. Б. асабліва пашырылася ў паэзіі сентыменталістаў і рамантыкаў (Р. Бёрнс, С. Т. Колрыдж, Ф. Шылер, І. В. Гёте, Г. Гейнэ, В. Гюго); у рус. л-ры такія Б. стваралі В. Жукоўскі, А. Пушкін, М. Лермантаў. На аснове бел. фальклору цыкл Б. напісаў А. Міцкевіч («Свіцязянка», «Пані Твардоўская», «Рыбка»). Бел. нар. паэзія з'явілася грунтам, на якім выраслі першыя Б. ў бел. л-ры («Нячысцік» А. Рыпінскага, «Травіца брат-сястрыца» В. Дуніна-Марцінкевіча, «Хцівец і скарб на святога Яна», «Балада» Ф. Багушэвіча). Выкарыстоўвалі нар. баладныя сюжэты Я. Купала («Забытая карчма», «Страшны вір»), Я. Колас («Нішчасная маці», «Мацерына прычытанне»), З. Бядуля («У калядную ноч», «Балада»). У развіцці сав. Б. як твора гераічнага характару важнае месца належыць М. Ціханаву, Э. Багрыцкаму, М. Святлову, У. Сасюру, А. Малышку. Сярод бел. Б. вылучаюцца «Камсамольскі білет» А. Куляшова, «Балада пра партызана Дубляу» М. Танка, «Балада пра Міколу Сасноўскага» П. Панчанкі, «Балада аб уральскім танку» А. Вялюгіна. *В. П. Разойша.* Мінск.

3) У музыцы — спачатку танц. нар. песня ў раманскіх краінах. Аднагалосая Б. была ўлюбёнай муз.-паэтычнай формай мастацтва трубераў; у эпоху Адраджэння існавала поліфанічная Б. (Г. дэ Машо, Г. Дзюфаі, Ф. Ландзіна). З канца 18 ст., асабліва ў час рамантызму, пашырылася Б. ў форме сольнай песні эпіка-фантаст. і драм. зместу (І. Р. Цумштэг, Ф. Шуберт, К. Лёве, А. Вярстоўскі, М. Глінка і інш.). Пачынальнікам інструментальнай (фп.) Б., характарам блізкай да вакальнай, стаў Ф. Шапэн. У сав. музыцы Б. трактуецца пераважна ў эпіка-драм. і гераічным планах. Вядомыя бел. Б.: сімф. «У суровыя дні» М. Аладава, вак.-сімф. «Балада аб чатырох заложніках» П. Падкавырава на словы А. Куляшова, харавая «Шумелі бярозы» А. Багатырова на словы М. Лужаніна.

БАЛАДУРЫН Іван Пятровіч [19.1(1.2).1905, с. Стары Горад Чыстапольскага пав. Казанскай губ.— 29.9.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Брагінскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 з групай байцоў фарсіраваў Дняпро, выбіў ворага з траншэй, заханіў гармату і кулямёт, адбіў контратаку і намог пераправіцца палку. Загінуў у баі.

БАЛАЖЭВІЧЫ, вёска ў Скрыгалаўскім с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Прыстань на р. Прыпяць. За 40 *км* на З ад Мазыра, 180 *км* ад Гомеля, 35 *км* ад чыг. ст. Козенкі. 511 ж., двароў 150 (1970). Цэх Мазырскага прамкамбіната перапрацоўкі драўніны. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка.

БАЛАІ, вёска ў Белькаўскім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Балышавік». За 28 *км* на ПнУ ад Паставаў, 238 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Полава. 214 ж., двароў 72 (1970). Клуб, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам.

БАЛАКІРАЎ Мілій Аляксеевіч [21.12.1836 (2.1.1837), Ніжні Ноўгарад — 16(29).5.1910], рускі кампазітар, піяніст, дырыжор, музычны дзеяч. З 1855 жыў у Пецярбурае. З 1857 вакол Б. пачала гуртавацца *«Магутная кучка»*. Па-



слядоўнік М. Глінкі і А. Даргамыжскага, прыхільнік поглядаў рэвалюц. дэмакратаў, у творчасці кіраваўся ідэяй народнасці і жыццёвай праўды. Аўтар двух зб. гарманізацый рус. нар. песень (1866, 1898). Нар. песні паслужылі меладычным матэрыялам яго аркестравых твораў («Увертюра на тэмы трох рускіх песень», 1858; увертюра «1000 гадоў», 1862, у пазнейшай рэд. «Русь»), вызначылі шляхі фарміравання нацыянальна-самабытнай гармоніі ў творчасці Б. і многіх яго сучаснікаў. У музыцы Б. творча выкарыстаны фальклорныя элементы народаў Каўказа (фп. фантазія «Ісламей», 1869; сімф. паэма «Тамара», 1882), чэш., ісп. фальклор. Побач з сімф. творамі жанравага плана Б. стварыў яркія ўзоры праграмнага сімфанізму абагульнена-драматычнага (увертюра «Кароль Лір», 1861) і карціна-апісальнага, сюжэтнага тыпаў («Тамара»). Вялікую ролю адыграў Б. у станаўленні рус. фп. музыкі ў кірунках канцэртна-віртуозным («Ісламей», канцэрт для фп. з арк. і інш.) і камерным (мазуркі, вальсы, накцюрны). Камерная лінія творчасці Б. выражана таксама ў рамансах з характэрным перапляценнем рус. і арыентальных матываў. Як дырыжор прапагандаваў айч. музыку ў канцэртах арганізаванай ім Бясплатнай муз. школы (з 1862), Рус. муз. т-ва (1867—69). У 1867 дырыжыраваў операмі Глінкі ў Празе.

Літ.: М. А. Балакирев. Исследования и статьи, Л., 1961; М. А. Балакирев. Воспоминания и письма, Л., 1962; М. А. Балакирев. Летопись жизни и творчества, Л., 1967.

БАЛАН Мікалай Харлампавіч (1917, с. Спаса Александрыйскага пав. Херсонскай губ.— 27.8.1954), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1943. У ліп. 1941 арганізаваў і ўзначаліў партыз. групу ў Бягомльскім р-не. З вер. 1942 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Мінскай*, з вер. 1943— *партызанскай брыгады «Разгром»* Мінскага злучэння. Пасля вайны скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КПБ, быў на гасп. рабоце. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

БАЛАНС (франц. balance літар. вага), 1) раўнавага, ураўнаважванне. 2) У эканоміцы — сістэма паказчыкаў, якія характарызуюць паляўнасць матэрыяльных, працоўных або фінансавых рэсурсаў і іх выкарыстанне. Гл. *Баланс грашовых даходаў і расходаў насельніцтва, Баланс даходаў і расходаў прадпрыемства, Баланс народнай гаспадаркі, Бухгалтарскі баланс, Міжгаліновы баланс, Плачежны баланс, Разліковы баланс.*

БАЛАНС ГРАШОВЫХ ДАХОДАЎ І РАСХОДАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА, састаўная частка балансу народнай гаспадаркі СССР, якая значае памер і крыніцы грашовых даходаў насельніцтва і асноўныя кірункі іх выкарыстання. На аснове звестак гэтага балансу вызначаюцца суадносіны паміж плацежаздольным попытам насельніцтва і яго тавараным забеспячэннем. Складаецца ў цэлым па СССР, а таксама ў саюзных рэспубліках, краях і абласцях. У даходнай частцы балансу паказваюцца заработная плата рабочых і служачых, грашовыя даходы калгаснікаў, пенсіі, стыпендыі і інш. У расходнай адлюстроўваюцца затраты насельніцтва на куплю тавараў у дзярж., кааператыўным гандлі, с.-г. прадуктаў на калгасным рынку, узносы і падаткі, аплата камунальна-бытавых і інш. паслуг, прырост грашовых зберажэнняў насельніцтва. У выніку баланс грашовых даходаў і расходаў насельніцтва паказвае рух грошай у краіне, г. зн. колькі іх выплачваецца насельніцтву дзярж., кааператыўнымі арг-цыямі і калгасамі і якімі шляхамі яны вяртаюцца назад у іх касы, якая частка грошай гар. насельніцтва пераходзіць сельскаму праз калгасны рынак. У тэрытарыяльным разрэзе баланс паказвае перамяшчэнне грошай паміж саюзнымі рэспублікамі, краямі, абласцямі і раёнамі краіны; вызначае попыт пакупнікоў і ўзаемасувязь яго з рыначнымі фондамі тавараў; на аснове балансу вызначаюцца суадносіны паміж тавараабаротам у гарадах і ў сельскай мясцовасці. Ён выкарыстоўваецца таксама пры планаванні розпічных цэн, тарыфаў, заработнай платы, рэальных даходаў насельніцтва і пры распрацоўцы касавага плана Дзяржбанка СССР. З яго дапамогай рэгулюецца грашовае абарачэнне ў краіне.

Літ.: Планирование народного хозяйства СССР, 2 изд., М., 1968, гл. 18; Гоголь Б. И. Платежеспособный спрос и розничный товарооборот, М., 1968.

А. Г. Заўялкаў. Мінск.

БАЛАНС ДАХОДАЎ І РАСХОДАЎ ПРАДПРЫЕМСТВА, сістэма паказчыкаў, якія характарызуюць даходы, расходы і фінансавыя вынікі дзейнасці прадпрыемстваў, заключная частка *тэхпрамфінплана.* Дае магчымасць кантраляваць гаспадарча-фін. дзейнасць, спрыяе мэтаваму і эканомнаму выдаткаванню ўласных і бюджэтных сродкаў, банкаўскіх крэдытаў, устойлівасці фін. становішча прадпрыемства. Распрацоўваецца фін. аддзелам прадпрыемства на аснове плана вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, каштарысу затрат на вытворчасць, разлікаў прыбытку, стварэння фондаў эканам. стымулявання, патрэбы ў прыросце абаротных сродкаў і інш. Складаецца з 4-х раздзелаў: даходаў і паступленняў сродкаў, расходаў і адлічэнняў, крэдытных узаемаадносін з банкамі, узаемаадносін з бюджэтам.

У 1-м раздзеле адлюстроўваюцца прыбытак, падатак з абароту, амартызацыйныя адлічэнні, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў і інш. артыкулы; у 2-м — капітальныя ўкладанні, прырост нарматываў уласных абаротных сродкаў, затраты на капітальны рамонт, страты, адлічэнні ад прыбытку і інш.; у 3-м раздзеле плануюцца атрыманне неабходных пазык для фінансавання мерапрыемстваў, вызначаных у прамфінплане, атрыманне доўгатэрміновых пазык для фінансавання цэнтралізаваных капітальных укладанняў, а таксама пагашэнне гэтых пазык; у 4-м раздзеле, які балансуе папярэднія, адлюстроўваюцца плацяжы ў бюджэт: падатак з абароту, плата за карыстанне асн. фондамі і абаротнымі сродкамі, фіксаваныя плацяжы, свабодны астатак прыбытку і асігнаванні з бюджэту.

Літ.: Финансы промышленности, М., 1968; Финансы предприятий и отраслей народного хозяйства, М., 1967; Рубанов Л. А., Ткачук М. И. и Шашковский А. В. Финансы социалистической промышленности, Мн., 1969.

А. В. Шашкоўскі. Мінск.

БАЛАНС НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ, сістэма навукова абгрунтаваных і ўзаемазвязаных эканамічных паказчыкаў, якія характарызуюць маштаб, тэмпы і найважнейшыя прапорцыі ў развіцці народнай гаспадаркі СССР і яе галін. Складаецца Дзяржпланам СССР, ЦСУ СССР і дзяржпланамі саюзных рэспублік. Тэарэт. аснова распрацоўкі Б. н. г.— марксісцка-ленінскае вучэнне пра расшыранае сацыялісц. ўзнаўленне, выходныя палажэнні якога выкладзены ў працах К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна. Упершыню асновы Б. н. г. былі выкарыстаны пры складанні плана ГОЭЛРО. Б. н. г. бывае планавы і справаздачны. Планавы баланс — найважнейшы сінтэтычны раздзел дзярж. народнагаспадарчага плана, які служыць для распрацоўкі і ўвязкі асноўных яго заданняў. Ён складаецца з сістэмы балансавых табліц і многіх раздзелаў, якія ахопліваюць усе фазы сацыялісц. расшыранага ўзнаўлення — вытворчасць, размеркаванне, абарачэнне і спажыванне грамадскага прадукту і нац. даходу. Справаздачны баланс адлюстроўвае вынікі завершанага ўзнаўлення, характарызуе ўзровень грамадскай вытворчасці і прапорцыі, якія склаліся паміж яе падраздзяленнямі. Ён з'яўляецца таксама крыніцай для навук. аналізу кірункаў, тэмпаў, прапорцый і агульных вынікаў развіцця эканомікі краіны за мінулы перыяд.

Найважнейшыя структурныя раздзелы Б. н. г.: зводны баланс народнай гаспадаркі; баланс вытворчасці, размеркавання і выкарыстання грамадскага прадукту; баланс вытворчасці, размеркавання і канчатковага выкарыстання нац. даходу; баланс працоўных рэсурсаў. Зводны Б. н. г. дае абагульненую карціну ўсяго працэсу сацыялісц. ўзнаўлення, вызначае гал. прапорцыі ў вытворчасці, размеркаванні, абарачэнні, спажыванні і накапленні грамадскага прадукту і нац. даходу. У другім раздзеле Б. н. г. паказваецца аб'ём вытворчасці матэрыяльных даброт, іх размеркаванне і выкарыстанне ў вартасным і натуральна-рэчыўнай форме. Ён адлюстроўвае агульны аб'ём сукупнага грамадскага прадукту ўсёй нар. гасп. і яе галін; паказвае, як грамадскі прадукт дзеліцца на сродкі вытворчасці і прадметы ўжытку, на фонд пакрыцця і нац. даход, вызначае долю фонду спажывання і накаплення ў нац. даходзе. Агульны аб'ём сукупнага грамадскага прадукту вылічваецца на пэўны перыяд як сума прадукцыі, што ствараецца ў галінах матэрыяльнай вытворчасці: прамысловасці, буд-ве, сельскай і лясной гасп., на грузавым транспарце, у сувязі і інш. Баланс грамадскага прадукту вылічваецца ў бягучых цэнах, а для вывучэння дынамікі развіцця нар. гасп.— у супастаўных (нязменных). Важнай састаўной часткай зводнага Б. н. г. з'яўляецца баланс вытворчасці і канчатковага выкарыстання нац. даходу. Гэты баланс характарызуе вартасную структуру ўзнаўлення, паказвае не толькі пачатковую і канчатковую яго стадыі, але і працэсы размеркавання і перараэмеркавання нац. даходу. У ім раскрываюцца наступныя паказчыкі: вытворчасць нац. даходу па галінах матэрыяльнай вытворчасці; яго першаснае размеркаванне на даходы сацыялісц. прадпрыемстваў і даходы працоўных, занятых у матэрыяльнай вытворчасці; перараэмеркаванне нац. даходу і канчатковае яго выкарыстанне на асабістае спажыванне, на накапленне і рэзервы. Баланс нац. даходу дапаўняецца балансамі грашовых даходаў і расходаў дзяржавы, насельніцтва і прадпрыемстваў. Важны раздзел Б. н. г.— *баланс працоўных рэсурсаў.* Ён адлюстроўвае паляўнасць працоўных рэсурсаў і іх размеркаванне, працэс узнаўлення рабочай сілы, служыць не толькі для ўліку і планавання выкарыстання наяўных рэсурсаў працы, а і для падрыхтоўкі і размеркавання кваліф. рабочых і спецыялістаў.

Паглыбленнем і развіццём Б. н. г. з'яўляецца міжгаліновы баланс вытворчасці і размеркавання грамадскага прадукту. Справаздачны міжгаліновы баланс у натуральным выражэнні ўпершыню быў распрацаваны ЦСУ СССР за 1959, потым выкарыстаны пры складанні пяцігадовых планаў развіцця нар. гасп. Ён выяўляе міжгаліновыя сувязі, узагадняе вытворчасць і спажыванне найважнейшых відаў прадукцыі і памагае вызначыць аптымальныя прапорцыі паміж галінамі народнай гаспадаркі. Выкарыстанне эканоміка-матэм. метадаў і вылічальных машын пры распрацоўцы мадэляў і варыянтаў міжгаліновага балансу — адзін з метадаў *аптымальнага планавання.*

Літ.: Ленін У. І. Аб адзіным гаспадарчым плане, Тв., т. 32 (Полн. собр. соч., т. 42); Яго ж. Па поваду так званага пытання аб рынках, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); Бор М. З. Вопросы методологии планового баланса народного хозяйства СССР, М., 1960; Методы планирования межотраслевых пропорций, М., 1965.

С. М. Малінін. Мінск.

БАЛАНС ПАДЗЕМНЫХ ВОДАЎ (грунтавых), колькасны паказчык кругазвароту вады ў ваданосных пластах. Прыходную частку складаюць жыўленне ваданосных пластоў за кошт прасочвання (інфільтрацыі) атмасферных ападкаў і паверхневых водаў, кандэнсацыі вадзяной пары, паступлення водаў з больш глыбокіх напорных гарызонтаў, арашальныя воды і інш. Расходная частка — падземны бакавы сцёк, прасочванне ў больш глыбокія нетры Зямлі, пераход у выніку фіз.-хім. рэакцый у звязаны стан з горнымі пародамі, выйсці падземных водаў у далінах рэк, водазабор артэзіянскімі калодзежамі, асушэнне пры меліярацыі і інш. У гарызонтах безнапорных грунтавых водаў у расходную частку ўваходзіць таксама выпарэнне з люстэрка водаў, праз зялёныя часткі раслін (транспірацыя), страта вады ў зоне аэрацыі шляхам плёначнага руху і інш. Гарызонты глыбокіх падземных водаў характарызуюцца больш пастаянным балансам, адкрытых грунтавых водаў — няўстойлівасцю балансу. У перыяд раставання снегу або дажджлівы асенні рэзка павялічваецца прыходная частка, у засушлівы летні або марозны зімовы — расходная. Вывучэнне Б. п. в. неабходна для колькаснай ацэнкі рэсурсаў падземных водаў і правільнага выкарыстання іх для водазабеспячэння, меліярацыі і рэгулявання воднага рэжыму тэрыторый пры асваенні забалочаных зямель, для прагнозаў рэжыму *грунтавых водаў* у зоне падпору каля вадасховішчаў і інш.

Літ.: Киселев П. А. Исследование баланса грунтовых вод по колебаниям их уровня, Мн., 1961; Режим и баланс подземных вод, в. 2, Мн., 1967.

П. А. Кісялёў. Мінск.

БАЛАНС ПРАЦОЎНЫХ РЭСУРСАЎ, сістэма паказчыкаў, якія характарызуюць чаканую або фактычную наяўнасць працоўных рэсурсаў, іх размеркаванне і выкарыстанне; адзін з раздзелаў балансу нар. гаспадаркі. Распрацоўваецца планавымі і стат. органамі і складаецца з 2 частак. У 1-й паказваецца колькасць рэсурсаў, г. зн. усё працаздольнае насельніцтва, у 2-й размеркаванне яго па сацыяльных групах, галінах нар. гасп., паміж сферай матэрыяльнай вытворчасці і невытворчай сферай. Супастаўленне частак балансу паказвае, у якой ступені развіццё вытворчасці і сацыяльна-культурнага буд-ва дае магчымасць выкарыстоўваць наяўныя працоўныя рэсурсы і як яны могуць забяспечыць намечаны аб'ём вытворчасці. З дапамогай Б. п. р. вылучаюцца патрэбы нар. гасп. ў рабочай сіле, крыніцы і формы забеспячэння кадрамі. Як гал. сродак планавання прапорцый у размеркаванні і выкарыстанні працоўных рэсурсаў Б. п. р. дае магчымасць вырашаць пытанні размяшчэння новых і расшырэння дзейных прадпрыемстваў, а таксама рацыянальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў. Справаздачны Б. п. р. складаецца напачатак, сярэдзіну года і за год, адлюстроўвае фактычную колькасць працоўных рэсурсаў і іх размеркаванне. Супастаўленне справаздачных балансаў за некалькі гадоў паказвае фактычныя колькасныя змены працоўных рэсурсаў, іх размеркаванне і выкарыстанне за адпаведны перыяд. Планавы Б. п. р. складаецца ў сярэднегадавым вылічэнні на адзін або некалькі гадоў. Справаздачны і планавы Б. п. р. складаюцца ў цэлым па нар. гасп. СССР і саюзных рэспубліках з размеркаваннем працоўных рэсурсаў па гарадской і сельскай мясцовасці.

Каб прааналізаваць стан працоўных рэсурсаў, іх размеркаванне і выкарыстанне, дадаткова да зводнага Б. п. р. па рэспубліцы складаюцца: а) тэрытарыяльныя балансы па абласцях з размеркаваннем працоўных рэсурсаў па гарадской і сельскай мясцовасці і асобна па гарадах, у якіх значаюцца суадносіны паміж наяўнасцю рэсурсаў і іх патрэбай, выяўляецца неабходнасць і магчымасць пераразмеркавання працоўных рэсурсаў; б) Б. п. р. калгасаў, якія дазваляюць вызначыць забяспечанасць калгасаў рабочай сілай на працягу ўсяго года, у перыяд найбольшага напружання с.-г. работ і магчымасць вызвалення частак працаздольных калгаснікаў для пастаяннай работы ў інш. галінах нар. гасп.; в) балансы рабочай сілы, якія вызначаюць дадатковую патрэбу прадпрыемстваў і галін нар. гасп. ў кваліфікаваных рабочых, план падрыхтоўкі гэтых кадраў у вучылішчах сістэмы прафесійна-тэхн. адукацыі, непасрэдна на прадпрыемствах і інш.; г) баланс спецыялістаў сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі, які вызначае дадатковую патрэбу і з'яўляецца асновай для распрацоўкі плана іх падрыхтоўкі; д) балансы працаўладкавання моладзі, якая канчае агульнаадукацыйныя школы. На аснове іх прадпр. і ўстановам даюцца планы прыёму гэтай моладзі на работу з папярэднім вытв. ле навучаннем.

Літ.: Планирование народного хозяйства СССР, 2 изд., М., 1968; Трудовые ресурсы СССР, М., 1961. *В. С. Гук.*


БАЛАНСАВАЯ ДРАЎНІНА (б а л а н с ы), круглы лесаматэрыял з елкі, сасны, асіны, таполі, піхты, сыравіна ў папяровай і цэлюлознай вытворчасці. Даўжыня 1—3 *м*, дыяметр 8—25 *см* у верхнім зрэзе.

БАЛАНСАВЫ МЕТАД (у п л а н а в а н н і і с т а т ы с т ы ц ы), сукупнасць прыёмаў для забеспячэння ўзгодненасці ўзаемазалежных паказчыкаў, адзін з найважнейшых метадаў распрацоўкі і кантролю выканання нар.-гасп. планаў, які забяспечвае неабходную прапарцыянальнасць у эканам. развіцці. З дапамогай Б. м. выяўляюцца неадпаведнасці ў эканоміцы, абгрунтоўваюцца прапорцыі ў развіцці гаспадаркі, размяркоўваюцца матэрыяльныя, працоўныя і грашовыя рэсурсы. Канкрэтна Б. м. выражаецца ў распрацоўцы сістэмы прыватных і зводных балансаў. Прыватныя характарызуюць наяўнасць і выкарыстанне а с о б н ы х відаў прамысл. і с.-г. прадукцыі, працоўных рэсурсаў пэўных галін і раёнаў краіны, грашовых даходаў і расходаў прадпрыемстваў, устаноў, арг-цый і інш. Зводныя адлюстроўваюць рэсурсы, размеркаванне і выкарыстанне ў с ё й прадукцыі, у с і х даходаў і ў с ё г а працаздольнага насельніцтва краіны. З іх дапамогай абгрунтоўваюцца абагульняльныя паказчыкі і агульнагасп. прапорцыі развіцця эканомікі: аб'ём і структура грамадскага прадукту і нацыянальнага даходу, фонды спажывання і накаплення, прапорцыі паміж прамысловасцю і с. гасп. і г. д. У сукупнасці зводныя балансы складаюць *баланс народнай гаспадаркі*. На сучасным этапе Б. м. набывае форму распрацоўкі матрычных эканоміка-матэм. мадэляў вытворчасці і размеркавання прадукцыі. Тыповая матрычная мадэль, складзеная на аснове Б. м.,— міжгалінавы баланс. Б. м. атрымлівае ў матрычных мадэлях строга матэм. выражэнне, што дае магчымасць шырока выкарыстоўваць вылічальную тэхніку ў планаванні і макс. збалансаваць планы. *А. Г. Зайлякаў.* Мінск.


БАЛАНСІР (франц. balancier каромысел), 1) рычаг, які вагаецца на восі і перадае намаганні ў машынах. Выкарыстоўваецца ў вымяральных прыладах, рысорных падвесках лакаматываў і вагонаў, у буравых і металарэзных станках, помпах і інш. 2) Маятнік (вагальнае кольца) у гадзіннікавым механізме, звязаны са спіральнай спружынай.

БАЛАНСІРОЎКА ў т э х н і ц ы, ураўнаважанне дэталяў, вузлоў машын ці прылад адносна восі іх вярчэння. Асн. віды Б.— статычная і дынамічная.

Станок Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі для балансіроўкі карданных валаў.



З дапамогай Б. паэбаўляюцца шкоднага дзеяння цэнтрабежных сіл, якія ўзнікаюць пры вярчэнні неўраўнаважаных дэталяў і выклікаюць вібрацыі





машын (прылад). Каб ураўнаважыць дэталь, спачатку вымераюць велічыню яе неўраўнаважаных мас у *гсм* (дысбаланс). Дысбаланс вузкай дэталі, напр. дыскавай пілы, вызначаюць на дзвюх апорах статычна: дэталь на апраўцы павернецца ўніз сваёй найб. цяжкай часткай. Пасля гэтай аперацыі на аблегчаным баку дэталі прымацоўваюць процівагі ці на ўцяжараным здымаюць лішкі металу. Статычную Б. звычайна выконваюць у адной плоскасці выпраўлення (перпендыкулярнай да восі вярчэння дэталі). Каб ліквідаваць дысбаланс на доўгіх дэталях, напр. на валах, робяць дынамічную Б. у дзвюх і больш плоскасцях выпраўлення. Дынамічную Б. выконваюць на станках. Пашыраны станкі з рухомымі ці цвёрдымі апорамі. Ваганні апораў або ціск на іх пры вярчэнні неўраўнаважанай дэталі ўспрымаюцца датчыкамі і ператвараюцца імі ў эл. сігналы, якія паступаюць у вымяральнае прыстасаванне. Станок, выраблены на Мінскім з-дзе імя Кастр. рэвалюцыі (гл. рыс.), мае ватметравае вымяральнае прыстасаванне, якое дае магчымасць рабіць настройку без эталона дэталі, ліквідаваць уздзеянне адной плоскасці вымярэння на другую і вызначаць велічыню і вуглавое становішча дысбалансу. Некат. станкі маюць прыстасаванні для аўтам. ўраўнаважання, паўторнага кантролю і інш. Для Б. складаных дэталяў, напр. каленчатых валаў, выкарыстоўваюць аўтам. лініі.

Літ.: Колесник Н. В. Статистическая и динамическая балансировка, М.— Л., 1954; Теория и конструкция балансировочных машин, под ред. В. А. Щепетильникова, М., 1963; Васильев В. С. и Кутко П. С. Станки и приборы для динамической балансировки, М., 1959.

БАЛАНТЫДЫЯЗ, хвароба, якая ўзнікае ад паражэння сценак тоўстага кішэчніка паразітычнымі інфузорыямі Balantidium coli. Носьбіты яе — свінні. У БССР выпадкі Б. вельмі рэдкія. Пераважна хварэюць людзі, якія працуюць у свінагадоўлі, на бойнях і ў каўбаснай вытворчасці. Заражэнне ідзе праз ежу, ваду, ад брудных рук. Трапіўшы ў арганізм, узбуджальнік Б. выклікае запаленне тоўстага кішэчніка з утварэннем язваў. Прыкметы: боль у жываце, тэмпература павышаецца да 38—39 °С, часты слізіста-крывяністы або слізіста-гнойны надворак. Дыягназ ставіцца пры наяўнасці ўзбуджальніка ў кале. Лячэнне: амінарсон, біяміцын, эмецін, ятрэн. Прафілактыка: строга трымацца правілаў гігіены, асабліва пры доглядзе свіней. Гл. таксама *Дызентэрыя. А. А. Ключарой.* Мінск.

БАЛАНЧЫВАДЗЕ, грузінскія савецкія кампазітары, бацька і сын.

Мелітон Антонавіч [24.12.1862(5.1.1863), в. Баноджа Кутаіскай губ.— 21.11.1937], нар. арт. Груз. ССР (1933). Вучыўся ў Пецярбургскай кансерваторыі ў М. Рымскага-Корсакава. Збіраў нар. песні, кіраваў хорамі, у 1918 заснаваў Кутаіскае муз. вучылішча (носіць яго імя). Пачынальнік груз. раманса і оперы («Дарэджан Каварная» па драм. паэме А. Цэрэтэлі, 1896—1926, паст. 1926, Тыфліс, урыўкі ставіліся ў 1897, Пецярбург).

Андрэй Мелітонавіч [н. 19.5(1.6).1905, Пецярбург], нар. артыст СССР (1968). Скончыў Тыфліскую (1927) і Ленінградскую (1931) кансерваторыі. З 1942 праф. Тбіліскай кансерваторыі. Аўтар першага нац. балета («Сэрца гор», 1936, 2-я рэд. 1938), значных сімф. твораў (2 сімфоніі, за 1-ю Дзярж. прэмія СССР 1946; сімф. карціны «Крцаніскі бой», «Мора», «Дняпро»; 4 канцэрты для фп. з аркестрам, за 2-і Дзярж. прэмія СССР 1947). З інш. твораў: опера «Мзія» (1950), балеты «Старонкі жыцця» (1961), «Мцыры» (1964).

Літ.: Хучуа П. Мелитон Баланчивадзе. Тбилиси, 1964; Орджоникидзе Г. Андрей Баланчивадзе, Тбилиси, 1967. *М. Ш. Ахметалі.* Тбілісі.

БАЛАНЧЫН Джордж (Balanchine; сапр. Георгій Мелітонавіч Баланчывадзе; н. 22.1.1904, Пецярбург), амерыканскі балетмайстар. Сын М. А. Баланчывадзе. Скончыў Пецярбургскае тэатр. вучылішча. Балетмайстарскую дзейнасць пачаў у 1923 у трупе «Малады балет» (Петраград). З 1924 за мяжой, балетмайстар труп С. Дзягілева і інш. З 1933 у ЗША. Арганізатар і кіраўнік трупы «Нью-Йорк сіці бале» (у 1962 быў з ёю ў СССР). Стваральнік спецыфічнага для амер. балета жанру: бессюжэтны танц. спектакль на класічную ці сучасную сімф. музыку. Часам дасягае зліцця музыкі і танца, у інш. спектаклях пры фармальнай адпаведнасці танц. рухаў метрарытмічнай структуры музыкі не перадае яе эмацыянальнай глыбіні. Паставіў больш за 100 балетаў.

БАЛАСТ (гал. ballast), 1) пясочны ці шчэбневы слой на чыгуначным палатне. Б. стварае пругкую аснову для шпалаў чыг. пуці, адводзіць ваду ад рэек і шпалаў, перашкаджае падоўжным і папярочным перамяшчэнням рэйка-шпальнай рашоткі, забяспечвае плаўны ход рухомага саставу. 2) Пясок, каменне, чыгуначныя зліткі і інш. для павелічэння асадкі і ўстойлівасці суднаў. Сучасныя марскія судны, і асабліва падводныя лодкі, выкарыстоўваюць як Б. ваду, якая заліваецца ў баластавыя цыстэрны. 3) Груз (пясок у мяшках) у гандоле аэрастата, які паступова скідаюць, каб набраць неабходную вышыню.

БАЛАСТЭР, пуцявая машына, якая ўкладвае баласт, падымае і рыхтуе чыгуначную каляю. Складаецца з устаноўленых на вагонных цялежках фермаў, на якіх размешчаны дазатары баласту, падымальнае і рыхтавачныя прыстасаванні, рэйкавыя і шпальныя шчоткі, выграбныя і планіравальныя нажы, механізмы кіравання. Адрозніваюць баластавальныя машыны, электрабаластэр, кансольныя электрабаластэры.

Б. прыводзяцца ў рух лакаматывамі. З 1940 на чыгунках СССР пры любых тыпах рэек і жалезабетонных шпалаў выкарыстоўваюцца электрабаластэры. Эл.-магн. батарэя замяляе сістэму ролікавых захопаў папярэдніх мадэляў Б., што павысіла грузападымальнасць электрабаластэраў да 33—44 *т* пры вышыні пад'ёму пуці 35—40 *см* і зруху ўбок на 25 *см*. На кансольным электрабаластэры падымальнае прыстасаванне размешчана на канцы кансольнай бэлькі (грузападымальнасць да 30 *т*). Пад кузавам, паміж вагоннымі цялежкамі,

Электрабаластэр (ЭЛБ-3).



устаноўлены плуг-дазатар з крыламі, якія выконваюць усе планіровачныя і баластавальныя работы, двухадвальны плуг з грабянямі-рыхліцелямі для выкідання грунту ці баласту пры перапаўненні дазатара. Скорасць Б. пры падыманні пуці да 10 *км/гадз*, пры дазіроўцы баласту да 15 *км/гадз*. Выкарыстоўваюцца з інш. пуцявымі машынамі (напр., пуцеўкладчыкамі, пуцявым стругам). Бываюць трактарныя Б.— дазіроўшчыкі, трактарныя планіроўшчыкі з аўтаўзроўнямі ці з каўшовымі дазатарамі (трактары прыстасаваны да руху па рэйках), баластаваачышч. машыны.

Літ.: Гуленко Н. Н. и др. Путевые машины и механизмы. Справочник, М., 1968.


А. В. Косць. Мінск.

БАЛАТОНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1945 (6—15 сакавіка), абарончая аперацыя войск 3-га Украінскага фронту (камандуючы Маршал Сав. Саюза Ф. І. Талбухін) у Айч. вайну каля воз. Балатан (Венгрыя).

Пасля *Будапешцкай аперацыі 1944—45* войскі 3-га Укр. фронту замацаваліся на лініі Гант — воз. Балатан — Барч — р. Драва. Войскі 2-га Укр. фронту (Маршал Сав. Саюза Р. Я. Маліноўскі) прарываць вызвалены 13 лют. Будапешт. Абодва фронты рыхтаваліся да наступлення на Вену. Каб аднавіць абарону на Дунаі, прыкрыць важныя ваенна-эканам. раёны Зах. Венгрыі, Паўд. Германіі і Аўстрыі, 6 сак. гітлераўскае камандаванне пачало контрнаступленне. Праціўнік адначасова нанёс тры ўдары: галоўны паміж азёрамі Веленцэ і Балатан у напрамку Дунай нанеслі 6-я агульнавайсковая і 6-я танкавая арміі, перакінутыя з заходнееўрап. фронту; дапаможныя — паміж воз. Балатан і р. Дравай на Капашвар наносілі 2-я танкавая армія і з паўд. берага Дравы на Печ — войскі арміі «Е». Сав. войскі лічылі сваёй задачай аслабіць праціўніка ў абарончых баях і стварыць спрыяльныя ўмовы далейшаму наступленню на захад. У Б. а. ўдзельнічалі таксама 1-я балгарская і 3-я югаслаўская арміі. Пасля цяжкіх 10-дзённых баёў гітлераўцы прасунуліся на 12—30 *км*, але прарвацца да Дуная не змаглі. Страціўшы каля 45 тыс. салдатаў і афіцэраў, каля 500 танкаў і штурмавых гармат, больш за 300 палявых гармат і мінамётаў, 15 сак. праціўнік мусіў перайсці да абароны. Спроба фаш. камандавання спыніць наступленне Сав. Арміі на паўд. крыле савецка-германскага фронту, зацягнуць ваенныя дзеянні, каб заключыць сепаратны мір, не ўдалася. 16—18 сак. войскі 3-га і 2-га Украінскіх франтоў пачалі Венскую аперацыю.

Літ.: Вторая мировая война 1939—1945 гг., под общ. ред. С. П. Платонова, М., 1958, с. 707—708; Малахов М. М. От Балатона до Вены, М., 1959; Советские Вооруженные Силы в борьбе за освобождение народов Югославии, под общ. ред. С. С. Бирюзова, М., 1960, с. 87—92.

БАЛАЦЯНІКІ (Limnaeidae), сямейства прэснаводных малюскаў класа бруханогіх. Маюць спіральна закручаныя танкасценныя ракавіны з вусцем, якое вар'іруе формай і памерамі. Цела можа поўнасцю ўцягвацца ў ракавіну. Рухаюцца з дапамогай нагі, падэшва якой укрыта слізвю. Орган дыхання — лёгкае. Насляюць Б. прэсныя вадаёмы, сустракаюцца таксама ў салаватых азёрах і ў прыбярэжнай частцы ўнутраных мораў. Некаторыя могуць перажываць часовае высыханне вадаёмаў. Кормяцца водарасцямі, тканкамі вышэйшых раслін, глеем і мёртвымі жывёламі. Гермафрадыты. Кладуць да некалькіх дзесяткаў яец. Жывуць каля 3 гадоў. Служаць кормам для некат. рыб. Амаль усе Б.— прамежкавыя гаспадары параэіт. чарвей чалавека і свойскай жывёлы. *І. С. Жарыкаў.* Мінск.



Балацянікі: *1* — азёрнік, або вычайны; *2* — вушкавы; *3* — балотны; *4* — авальны; *5* — малы.

БАЛАЧАНКА, рака, левы прыток Свіслачы (бас. Бярэзіны). Даўж. 36 *км*. Пачынаецца на паўд. схілах Цэнтральнабярэзінскай раўніны, цячэ ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. і Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. Рэльеф вадазбору (418 *км*²) раўнінны, у вярхоўях — узгорысты. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2,4 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры асушэнні балотаў.

БАЛАШЫ, вёска ў Рэчкаўскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Ленінскі камсамол». За 21 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 125 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Княгініна. 239 ж., двароў 84 (1970). Васьмігадовая школа, б-ка, магазін.

БАЛАШЭВІЧЫ, вёска ў Хваставіцкім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр калгаса «Вільча». За 7 *км* на З ад Глуска, 177 *км* ад Магілёва, 25 *км* ад чыг. ст. Ратміравічы. 822 ж., двароў 219 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін.

БАЛГАР, Булгар, Вялікі Балгар (з 1399), сталіца *Балгарыі Волжска-Камскай*. Руіны горада каля с. Балгары Куйбышаўскага р-на Тат. АССР.

Паводле пісьмовых арабскіх крыніц вядомы з 10 ст. З 2-й пал. 13 ст. важны гандлёвы і рамесніцкі цэнтр *Залатой Арды*. У 1361 Б. разбураны залатаардынскім ханам Булак-Цімурам. З пач. 15 ст. заняпаў у сувязі з ростам палітычнага значэння Казані. Збераглісяархітэктурныя помнікі 14—15 ст.: мячэць, мінарэт, маўзалеі, лазні і інш. Пры раскопках выяўлены рэшткі дамоў рамеснікаў, ганчарныя і чыгунаплавільныя горны, водаправод, брукаваная вуліца; знойдзены прылады працы, упрыгожанні, манеты. Многія знаходкі сведчаць пра сувязь Б. з Руссю, Каўказам, Крымам, краінамі Азіі.

Літ.: Смирнов А. П. Волжские булгары, М., 1951 (Труды Государственного исторического музея, в. 19); Шпилевский С. М. Древние города и другие булгарско-татарские памятники в Казанской губернии, Казань, 1877.

БАЛГАРСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК (БАН), заснавана ў 1869 як Балгарскае таварыства прыгожага пісьменства, в 1911 БАН. Знаходзіцца ў Сафіі. Прэзідэнт Ангел Балеўскі (з 1968). У складзе БАН (1969) 6 ганаровых чл., 45 акад. (правадз. чл.), 57 чл.-кар. Мае 9 аддз.: матэм. і фіз. навук; тэхн. навук; хім. навук; геал. і геаграфічных навук; біял. навук; мед. навук; філас., эканам. і юрыдычных навук; гістар. і пед. навук; мова-, літаратуразнаўства і мастацтвазнаўства. Аддзяленні аб'ядноўваюць 34 ін-ты, 4 цэнтр. лабараторыі і інш. н.-д. ўстановы. У сістэму БАН уваходзяць Цэнтр. б-ка, «Балгарская энцыклапедыя» і інш. ўстановы. Акадэмія выдае 15 час. і «Весці» некат. ін-таў. У 1961 у Балгарыі створана таксама Акадэмія с.-г. навук.

БАЛГАРСКАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ (БКП). Асновы партыі закладзены ў 1891, калі сацыяліст. гурткі, што ўзніклі ў розных раёнах краіны, аб'ядналіся па ініцыятыве Дз. *Благоева* ў Балгарскую с.-д. партыю (БСДП). Пасля таго як на X з'ездзе (1903) з партыі былі выведзены сацыял-рэфармісты (шырокія сацыялісты), сфарміравалася самастойная рэвалюц.-марксісцкая Балг. рабочая с.-д. партыя (цесных сацыялістаў) — БРСДРП (ц. с.). Класавай непрымірымасцю да буржуазіі і паслядоўнай барацьбой супраць рэфармістаў БРСДП (ц. с.) была бліжэй за інш. партыі 2-га Інтэрнацыянала да бальшавікоў, горача прапагандавала ідэі Кастр. рэвалюцыі. Яна ўдзельнік заснавання Камінтэрна. XXII з'езд (адбыўся 25—27.5.1919 у Сафіі) прыняў рашэнне аб перайменаванні партыі ў Балг. камуніст. партыю (цесных сацыялістаў) — БКП (ц. с.), абвясціў сябе І з'ездам БКП (ц. с.). Дэлегаты прынялі «Праграмную дэкларацыю». Паводле яе найважн. задача партыі — сацыяліст. рэвалюцыя ў краіне. Пасля фаш. перавароту ў Балгарыі (9.6.1923) балг. працоўныя па закліку БКП (ц. с.) узняліся (вер. 1923) на ўзбр. паўстанне (гл. *Вераснёўскае антыфашысцкае паўстанне 1923*). Ва ўмовах масавага тэрору, развязанага фаш. рэжымам пасля задушэння паўстання, партыя дзейнічала падпольна, выкарыстоўвала легальныя і нелегальныя формы работы. У 1927 пад кіраўніцтвам БКП (ц. с.) створана легальная Рабочая партыя (РП). Пасля VII канграсу Камінтэрна (1935) партыя разграміла левых сектантаў, бальшавізавалася. У 1938 аб'ядналася з РП і атрымала назву Балг. рабочая партыя (БРП). Яе ўзначалілі Г. *Дзімітроў*, В. *Калараў*, Т. Костаў. Пасля нападу фаш. Германіі на СССР БРП заклікала балг. народ змагацца з акупантамі і іх памагатымі, аб'ядналавакол Айч. фронту (засн. ў 1942) усе антыфаш. сілы, стварыла паўстанцкую армію. Пасля ўступлення сав. войскна тэр. Балгарыі БРП узначаліла ў вер. 1944 узброенае паўстанне, якое ліквідавала манарха-фаш. дыктатуру ў краіне. На выбарах у Вялікі народны сход (1946) Балг. рабочая партыя (камуністаў) — БРП(к), такая назва з вер. 1944, атрымала большасць галасоў. У 1948 с.-д. партыя (шырокіх сацыялістаў) аб'ядналася з БРП(к), гэта ліквідавала раскол у радах рабочага класа. V з'езд партыі (1948) прыняў праграму будаўніцтва сацыяліст. грамадства ў Балгарыі, перайменаваў БРП(к) у БКП. VII з'езд (1958) канстатаваў, што сацыяліст. вытворчыя адносіны перамаглі ў горадзе і вёсцы, VIII (1962) паставіў задачу завяршыць пабудову сацыялізма, IX (1966) прыняў дырэктывы па пятым 5-гадовым плане (1966—70) развіцця нар. гасп. Дэлегацыі БКП удзельнічалі ў рабоце Нарад прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый у Маскве (1957, 1960 і 1969), падпісалі прынятыя там дакументы. БКП паслядоўна выступае за адзінства сацыяліст. краін і сусв. камуніст. руху на прынцыпах марксізма-ленінізма. Налічвае 611 179 чл. (на ліст. 1966). Першы сакратар ЦК БКП Т. *Жыўкаў*. Цэнтр. друкаваны орган — газ. «Работническо дело» («Рабочая справа»), тэарэтычны час.— «Ново време» («Новы час»).

Літ.: История Болгарской коммунистической партии, пер. с болг., М., 1960; История на Българската комунистическа партия, София, 1969.

Д. В. Мельцэр. Мінск.

БАЛГАРСКАЯ МОВА, належыць да паўд. групы *славянскіх моў*. Мае дзве асн. групы гаворак: усходнюю і заходнюю. Акрамя Балгарыі, пашырана сярод балг. насельніцтва Югаславіі, Румыніі і СССР. На ёй гаворыць каля 8 млн. чал. У Б. м. 6 галосных і 37 зычных фанем. Спецыфічна балгарскі галосны гук «ъ» не характэрны астатнім славянскім мовам.

У Б. м., як і ў макед., алб., рум., навагрэч. і інш. мовах балканскага моўнага саюзу, няма інфінітыва і іменных склонавых формаў; у грамат. функцыях шырока ўжываюцца прыназоўнікі; ёсць постпазіцыйны артыкль («книгата», «човекът»); аналітычна ўтвараюцца будучы час дзеясловаў («ще пиша» — «буду пісаць»), а таксама ступені параўнання прыметнікаў («голлям», «по-голлям», «най-голлям» — «вялікі», «большы», «самы вялікі, найбольшы») і прыслоўяў («тихо», «по-тихо», «най-тихо» — «ціха», «цішэй», «найцішэй»). Алфавіт на рус. аснове, у ім няма літар «я», «ю», «ы».

Пісьменнасць на Б. м. ўзнікла ў 9 ст., калі *Кірыл і Мяфодзій* пераклалі царк. кнігі з грэч. мовы на балг.-макед. дыялект г. Салуні. Пазней гэтая пісьмовая мова стала агульнай літ. мовай для паўд. і ўсх. славян і вядома пад назвай *стараславянскай мовы*. З 14 ст., калі туркі захапілі балг. землі, на тэр. Балгарыі пісьменнасць на стараслав. мове заняпала. У 2-й пал. 16 ст. ў дамаскіны (зб. рэлігійна-дыдакт. л-ры) пранікае жывая нар. мова. Сучасная, ці новабалгарская, літаратурная мова сфарміравалася ў 19 ст. на базе паўн.-ўсх. гаворак Балгарыі і не з'яўляецца непасрэдным працягам стараславянскай (старабалгарскай) мовы.

Літ.: Маслов Ю. С. Очерк болгарской грамматики, М., 1956; Андрейчин Л. Грамматика болгарского языка, пер. с болг., М., 1949; Столнов С. И. Граматика на българския книжовен език, София, 1964.

Г. А. Цыхун. Мінск.

БАЛГАРЫЯ (България, Народна Република България, НРБ), дзяржава ва ўсх. частцы Балканскага п-ва. Пл. 111 тыс. *км*². Нас. 8472 тыс. чал. (1968). Сталіца Сафія. Краіна падзяляецца на 30 акруг.




Дзяржаўны лад. НРБ — сацыялістычная дзяржава. Канстытуцыя прынята 4.12.1947. Вышэйшы орган дзярж. улады — аднапалатны Нар. сход, а ў перыяд паміж сесіямі — яго Прэзідыум, які выбіраецца Нар. сходам. Нар. сход выбіраецца на 4 гады шляхам усеагульных, роўных, прамых выбараў пры тайным галасаванні. Вышэйшы выканаўчы орган

дзярж. улады — Савет Міністраў, які ўтвараецца Нар. сходам. Мясцовыя органы дзярж. улады — Нар. Саветы. Яны выбіраюць выканаўча-распарадчыя органы — управы. Вышэйшы судовы орган — Вярх. суд. Народнымі Саветамі выбіраюцца мясцовыя суды (акруговыя і акалійскія).

Прырода. Рэльеф Б. разнастайны (карту гл. на ўкл.). На Пн Дунайская раўніна, якая паступова павышаецца на Пд, дзе абмежавана самым доўгім горным ланцугом краіны — Стара-Планіна (г. Боцеў, 2376 *м*). Сярэдняя Б. — чаргаванне невялікіх горных масіваў і міжгорных катлавін (Сафійская, Казанлыкская, Даімітроўская). Там жа Верхнефракійская нізіна. Паўд. Б. занята гарамі: на З масівы Рыла (г. Мусала, 2925 *м*) і Пірын (г. Віхран, 2914 *м*), далей на У — Радопы (г. Галям-Пералік, 2191 *м*). Карысныя выкапні: жалезныя, медныя, свінцова-цынкавыя, хромавыя, марганцавыя, сярэбраныя, уранавыя, кобальтавыя і інш. руды; ёсць лігніт, буры і кам. вугаль, нафта, газ, кам. соль, вапняк, каалін. Клімат Б. ўмерана кантынентальны, у катлавінах на Пд блізкі да міжземнаморскага, у гарах больш суровы. Сярэдняя гадавая т-ра каля 10,5, сярэдняя студз. —2 на Пн і 2 на Пд, ліп. 21—25 °С. За год выпадае каля 650 *мм* ападкаў, на ПнУ каля 450—500 *мм*, у гарах да 1000 *мм*. Рачная сетка належыць да бас. Чорнага (Дунай, рэкі ўзбярэжжа) і Эгейскага (Струма, Марыца) мораў. Суднаходны толькі Дунай. Горныя рэкі маюць вял. запасы гідраэнергіі. На Дунайскай раўніне і ў міжгорных катлавінах чарназёмныя глебы, у перадгор'ях шэрыя лясныя ападзоленыя, у гарах бурыя лясныя, горна-лугавыя, месцамі шкілетныя. Лясы (29% пл. краіны) шыракалістыя (дуб, бук, граб) і хвойныя (хвоя, елка, піхта). Пашраны хмызнякі (шыбляк). Раўнінныя прасторы разараны.

Насельніцтва. 88% — балгары, народ з групы паўд. славян, па мове, пісьменнасці і культуры вельмі блізкія да рускіх, украінцаў, беларусаў. Жывуць таксама туркі (8,6%), цыганы (2,6%), армяне (0,3%) і інш. Сярод веруючых большасць праваслаўных. Пры сярэдняй шчыльн. 76 чал. на 1 *км*² больш заселены нізіны і катлавіны (100 і болей чал. на 1 *км*²). У гарах да 40 чал. на 1 *км*². 51,5% насельніцтва жыве ў сельскай мясцовасці. Найбольшыя гарады: Сафія (848 тыс. ж., 1968), Плоўдзіў (237 тыс.), Варна (206 тыс.), Русе (145 тыс.), Бургас (127 тыс.).

Гістарычны нарыс. Паселение чалавека на тэр. Б. адносіцца да эпохі сярэдняга *палеаліту*. У 7—6 ст. да н. э. ў фракійскіх плямёнаў — старажытнаабшчынага ладу і станаўленне класавага гр-ва. У 4—1 ст. да н. э. плямёны змагаліся супраць македонцаў, пасля супраць рымлян. Апошнія ў 46 да н. э. сталі поўнымі гаспадарамі на Балканах. У 395 н. э. пры падзеле Рымскай імперыі тэр. сучаснай Б. адышла да Візантыі. У канцы 5 — пач. 6 ст. на яе пачалі нападаць слав. плямёны (склавіны і анты), у пач. 7 ст. яны пасяліліся на Балканскім п-ве. Класавая дыферэнціяцыя сярод славян і пагроза з боку Візантыі, якая імкнулася аднавіць сваё панаванне на занятых славянамі землях, паскорылі працэс фарміравання дзяржавы. У прыдунайскіх землях склаўся саюз Сямі слав. плямёнаў. У 680 дружыны цюркскага племені пратабалгар на чале з ханам Аспарухам перайшлі Дунай, перамаглі візантыйцаў, заключылі пагадненне з важакамі Сямі слав. плямёнаў. Стварылася аб'яднаная славяна-балг. дзяржава. У 681 Візантыя прызнала яе незалежнасць. Першая балг. дзяржава (681—1018) была раннефеад. тыпу. У 2-й пал. 9 ст. хрысціянства стала ў ёй афіц. рэлігіяй. Яно спрыяла ўстаўленню феад. адносін, паляпшэнню міжнар. становішча балг. дзяржавы, фарміраванню балг. народнасці. У гады праўлення цара Сімяона [893—927] Б. вяла войны супраць Візантыі. Яна павялічыла сваю тэрыторыю, дасягнула значнага росквіту. Але войны, узмацненне феад. эксплуатацыі пагаршалі становішча сялян. Іх нездаволенасць вылілася ў 10 ст. ў форме рэліг. ерасі — *багамільства*. Аслабленнем феад. міжусобіцаў Б. не здолела адбіць новага нападу Візантыі і ў 1018 падпала пад яе ўладу. Балгары падымаліся на барацьбу супраць чужаземцаў (1040, 1072, 1074, 1079, 1084). Паўстанне 1185—87 на чале з братамі Асенем і Пятром стала ўсенародным. У 1187 Візантыя мусіла прызнаць незалежнасць балг. дзяржавы. За гады праўлення цара Івана Асеня II [1218—41] у выніку ваен. і дыпламат. поспехаў Б. значна пашырыла тэрыторыю (далучана большая частка Фракіі, Македоніі, Албаніі), стала самай моцнай дзяржавай на Балканах. У 2-й пал. 13 ст. феад. адносіны ў краіне дасягнулі высокай ступені развіцця. Жорсткая феад. эксплуатацыя, набегі тат. ордаў даводзілі сялянства да галечы. У краіне ўспыхнулі антыфеад. паўстанне (1277—80) на чале з пастухом Івайлам. Феад. міжусобіцы прывялі да распаду балг. дзяржавы на два царствы і княствы. У 14 ст. іх тэрыторыі сталі аб'ектам захопніцкай палітыкі *Асманскай імперыі*. Туркі захапілі ў 1393 Тырнава, пазней перамаглі Тырнаўскае, у 1396 Відзінскае царствы, у канцы 14 ст. — княствы Дабруджу. Феад. эксплуатацыя народа дапоўнялася жорсткім нац. і рэліг. прыгнётам. Балгары ўпарта змагаліся супраць тур. няволі (паўстанне на чале з Канстанцінам і Фружынам 1404, Тырнаўскія паўстанні 1598 і 1686, Чыпраўскае 1688 і інш., гайдуцтва). З 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. у Б. ўзнікаюць капіталіст. адносіны, пагыбляецца класавае расслаенне сялянства. Гарады становяцца гандл.-прамысл. цэнтрамі. Расце нац. самасвядомасць балгар. У 1762 паявілася ў рукапісе кніга Паісія Хілендарскага (1722—98) «Гісторыя славянабалгарская». З яе пачалася эпоха адраджэння балг. народа. У 30-я г. 19 ст. нац. рух набыў форму барацьбы за нац. свецкую школу, а ў 40—60-я г. за стварэнне незалежнай балг. царквы (у 1870 Б. атрымала аўтаномную царк.



Старажытная сталіца Балгары Вяліка-Тырнава.

арганізацыю). Супраць тур. феадалаў узняліся сяляне (паўстанні 1835—36, 1841, 1850, 1856). У барацьбе за сваю незалежнасць балгары апіраліся на дапамогу рус. народа, актыўна падтрымлівалі рус. войскі ў войнах Расіі супраць Турцыі (1806—12, 1828—29, 1853—56).


У 2-й пал. 19 ст. нац.-вызв. рух узмацніўся. Яго ўзначалілі дзеячы балг. адраджэння рэвалюц. дэмакраты Г. С. *Ракоўскі*, Л. *Каравелаў*, В. *Леўскі*, Х. *Боцеў*. У 1869 арганізаваны Балг. рэвалюц. цэнтр. камітэт. У краіне ўзнікае разгалінаваная сетка мясцовых рэвалюц. к-таў. У 1875 адбылося Старазагорскае паўстанне, а потым самае масавае выступленне балг. народа супраць тур. панавання — Красавіцкае паўстанне 1876. Абодва паўстанні былі задушаны. Быў пераможаны і атрад Боцева, у падрыхтоўцы і аснашчэнні якога актыўна ўдзельнічаў блізкі сябар Боцева рэвалюцыянер-дэмакрат беларус М. К. *Судзілоўскі*. Нечуваныя зверствы тур. феадалаў у час разгрому паўстанняў выклікалі абурэнне прагрэс. грамадскасці многіх краін. На Беларусі, як і па ўсёй Расіі, разгарнуўся шырокі рух на падтрымку балг. народа. Толькі насельніцтва Мінскай губ. сабрала больш за 13 тыс. руб. З Беларусі выехалі добраахвотнікі, каб удзельнічаць у барацьбе на баку балгар. Падзеі ў Б. абвастрылі Усходні крызіс (гл. *Баснійскія крызісы*), які прывёў да руска-тур. вайны 1877—78. У час яе воіны 54-га пяхотнага Мінскага палка адны з першых фарсіравалі 27.6.1877 Дунай і вызвалілі г. Свіштоў. Перадавы атрад рус. арміі на Балканах узначальваў таленавіты палкаводзец, ураджэнец Беларусі ген.-л. І. У. *Гурка*. Беларусы ўдзельнічалі ў гераічнай абароне Шыпкінскага перавалу, у баях за Плеўну і Стара-Загору. Сан-Стэфанскі мірны дагавор 1878, якім скончылася вайна, прадугледжваў стварэнне самастойнай балг. дзяржавы. Але пад націскам вах. краін удзельнікі Берлінскага кангрэсу 1878 прынялі рашэнне падзяліць Б. на Балг. княства (у васальнай залежнасці ад Турцыі) і аўтаномную Усх. Румелію ў межах Турэцкай імперыі. Фракія і Македонія зноў адышлі да Турцыі. Падзел тэр. Б. не ліквідаваў станоўчых вынікаў вайны 1877—78. Яна прывяла да важных сацыяльных змен у Б., адыграла ролю буржк.-дэмакр. рэвалюцыі. У час вайны і ў першыя гады пасля яе былі закладзены асновы самастойнай нац. балг. дзяржавы (арганізацыя грамада. адміністрацыі, узброеных сіл), паскораны працэс ліквідацыі тур. феад. землеўладання, цэхавай сістэмы арганізацыі працы ў гарадах. Свабодная канкурэнцыя абагнала рамеснікаў, стварала рэзервы рабочай сілы для капіталіст. прамысловасці. Устаноўчы сход 28.2—28.4.1879 прыняў бурж. Тырнаўскую канстытуцыю, якая замацавала незалежнасць Б., спрыяла развіццю капіталізму. Выбраны на трон Балг. княства (па рэкамендацыі краін — удзельніц Берлінскага кангрэсу 1878) нямецкі прынц Аляксандр Батэнберг [1879—86] у 1881 адмяніў канстытуцыю, а ў знешняй палітыцы імкнуўся аблізіць Б. з Аўстра-Венгрыяй і Германіяй. Патрыят. рух супраць падзелу краіны перарос ва ўзбр. паўстанне (вер. 1885). У выніку яго Усх. Румелія ўз'ядналася з Балгарскім княствам. Супраць аб'яднання краіны выступіла Сербія, якая 2.11.1885 напала на Б., але была пераможана. Бухарэсцкі мірны дагавор 1886 замацаваў новыя граніцы Б. Частка балг. буржуазіі, якая арыентавалася на Расію, 9.8.1886 зрабіла пераварот, аднак уладу захапілі бурж. колы, што падтрымлівалі палітыку Аўстра-Венгрыі і Германіі. Яны зноў пасадзілі на трон ням. прынца Фердынанда Кобургскага [1887—1918].

У канцы 19 ст. ў Б. хуткімі тэмпамі развіваецца капіталізм, расце рабочы клас, узнікаюць прафсаюзы. Сярод рабочых распаўсюджваюцца ідэі навук. сацыялізма. У 1891 пад кіраўніцтвам Дз. *Благоева* засн. Балг. с.-д. партыя (гл. *Балгарская камуністычная партыя*). Пасля выгнання апартуністычнага крыла, т. зв. шырокіх сацыялістаў, у 1903 аформілася Балг. рабочая с.-д. партыя (цесных сацыялістаў) — БРСДП (ц. с.). Яна моцна ўплывала на рабочы рух. Узмацняецца рух сялян. У канцы 1899 засн. Балгарскі земляробчы народны саюз (БЗНС). Бурж. рэвалюцыя 1908 у Турцыі спрыяла барацьбе балг. народа за незалежнасць. Б. пазбавілася ад васальнага падпарадкавання Турцыі, абвясціла (кастр. 1908) сваю поўную незалежнасць. Фердынанд прыняў тытул «цара балгар». У 1912 Б. заключыла саюзныя дагаворы з Сербіяй, Грэцыяй і Чарнагорыяй (гл. *Балканскі саюз 1912*) супраць агульнага ворага — Турцыі і аўстра-венг. экспансіі на Балканах. У 2-й Балканскай вайне (гл. *Балканскія войны*) Б. была пераможана, страціла тэрыторыі, набытыя ў 1-й Балканскай вайне, і частку сваіх старых тэрыторый. У 1-й сусв. вайне Б. ўдзельнічала на баку Германіі і Аўстра-Венгрыі. Паводле Нёіскага мірнага дагавору 1919 краіны-пераможцы атрымалі каля 11,3 тыс. *км*² балг. тэрыторыі. Б. павінна была выплаціць рэпарацыю ў 2250 млн. залатых фр. Краіну акупавалі войскі Антанты.

Кастр. рэв. ў Расіі зрабіла вялікі ўплыў на нар. масы Б. Салдаты балг. арміі паспрабавалі скінуць бурж.-манархічную ўладу. Уладайскае паўстанне 1918, у якім удзельнічала каля 30 тыс. салдатаў, праходзіла пад лозунгам: «Зробім так, як рускія браты!». З дапамогай ням. войск урад задушыў паўстанне. Але цар Фердынанд мусіў адмовіцца ад трона на карысць свайго сына Барыса [1918—43]. Рэвалюц. ўздым нар. мас мацнеў. У маі 1919 на XXII з'ездзе БРСДП (ц. с.) абвешчана Балгарскай камуніст. партыяй (ц. с.) — БКП (ц. с.). Пад яе кіраўніцтвам прайшла ўсеагульная паліт. стачка чыгуначнікаў і работнікаў сувязі (снеж. 1919 — люты 1920). На выбарах у Нар. сход 28.3.1920 перамог БЗНС. Яго лідэр А. Стамбалійскі ўтварыў аднапартыйны ўрад, правёў дэмакр. законы аб працоўным абавязку, абмежаванні зямельнай уласнасці да 30 *га*, прагрэсіўна-падаходным падатку. Законы абмяжоўвалі інтарэсы маёмнай буржуазіі, але не закраналі асноў капіталіст. ладу. Напалоханая ростам рэвалюц. сіл рэакц. буржуазія з дапамогай тайнай фаш. арг-цыі «Народная змова» 9.6.1923 арабіла дзярж. пераварот і ўстанавіла рэжым фаш. дыктатуры. Па закліку ЦК БКП у ноч на 23.9.1923 па-

Сустрэча балгарскіх партызан 9 верасня 1944 (злева). Шыпка. Від на вяршыню Сталетава. Помнікі рускім воінам і балгарскім апалчэнцам, якія загінулі ў руска-турэцкай вайне 1877—78.





чалося нар. ўзбр. паўстанне (гл. *Вераснёўскае антыфашысцкае паўстанне 1923*), якое было жорстка задушана. Рэформы Стамбалійскага былі адменены, БКП, дэмакр. партыі і арг-цыі забаронены.

Сусв. эканам. крызіс 1929—33 паралізаваў усю капіталіст. сістэму Б. Барацьба працоўных набыла новую сілу. Пасля выбараў у Нар. сход 21.6.1931 да ўлады прыйшоў урад Нар. блока (кааліцыі бурж. партый і БЗНС). Але прыкметных змен ва ўнутранай і знешняй палітыцы не адбылося. Класавая барацьба ў краіне не спынялася. Каб умацаваць пазіцыі манапаліст. буржуазіі, Ваенная ліга (аб'яднаўвала рэакц. афіцэрства) і паліт. група «Звяно» 19.5.1934 зрабілі дзярж. пераварот. Былі распушчаны Нар. сход, усе паліт. партыі і прафсаюзы, што стварыла перадумовы для ўсталявання манарха-фаш. дыктатуры.


У 2-ю сусв. вайну ўрад Б. насуперак волі народа і нац. інтарэсам краіны далучыўся да блока фаш. дзяржаў. Калі Германія напала на СССР, урад не адважыўся абвясціць вайну Сав. Саюзу, але аддаў у распараджэнне герм. камандавання ўсе матэрыяльныя рэсурсы краіны, аэрадромы, чыгункі. 13.12.1941 Б. абвясціла вайну Вялікабрытаніі і ЗША. У адказ на палітыку кіруючых колаў разгарнуўся магутны антыфаш. рух, сфарміраваліся партыз. атрады, якія ў 1943 аб'ядналіся ў адзіную Нар.-вызв. паўстанцкую армію. 17.7.1942 была абвешчана праграма Айчыннага фронту (АФ): скінуць манарха-фаш. рэжым, устанавіць нар.-дэмакр. ўладу. Балг. ўрад не парываў саюзу з фаш. Германіяй і адначасова вёў сакрэтныя перагаворы з ваен. камандаваннем ЗША і Вялікабрытаніі пра акупацыю Б. іх войскамі. 5.9.1944 сав. ўрад выкрыў дваістую палітыку бурж. ўрада Б. і абвясціў правячым колам Б. вайну. Уступленне сав. войск на тэр. Б. стварыла ўмовы для рашучага ўдару па рэакцыі. У ноч на 9.9.1944 узбр. рабочыя разам з Нар.-вызв. паўстанцкай арміяй і патрыятычна настроенымі часцямі балг. арміі скінулі манарха-фаш. рэжым (гл. *Вераснёўскае народнае ўзброенае паўстанне 1944*), выратавалі краіну ад нац. катастрофы. Быў сфарміраваны ўрад АФ, кіруючая роля ў ім належала камуністам. У гісторыі балг. народа пачалася новая эпоха — эпоха сацыялізма. У краіне былі праведзены глыбокія сац.-эканам. пераўтварэнні: распушчаны бурж. парламент, адменены антынародныя законы, забаронены фаш. арг-цыі, вінаватыя ва ўцягненні Б. ў вайну аддадзены пад суд, а іх маёмасць канфіскавана. Урад АФ аднавіў паліт. правы і свабоды народа, стварыў нар. міліцыю і суд, ажыццявіў перабудову арміі. Яшчэ да падпісання перамір'я (Масква, 28.10.1944) Балг. Нар. армія пачала змагацца супраць фаш. Германіі (урад АФ абвясціў ёй вайну 10.9.1944). Пры ўзаемадзеянні з сав. войскамі і часцямі Югаслаўскай нар.-вызв. арміі яна вызваляла Македонію, Сербію, Венгрыю, Аўстрыю. Больш за 120 тыс. балг. ваеннаслужачых узнаг. ордэнамі і медалямі СССР. 18.11.1945 адбыліся выбары ў Нар. сход. Большасць балг. народа (88,2%) выказалася за нар.-дэмакр. ўладу. На падставе ўсенароднага рэферэндуму 8.9.1946 манархія была ліквідавана, Б. абвешчана Народнай Рэспублікай (15.9.1946). Пасля выбараў у Вялікі нар. сход 27.10.1946 урад узначаліў Г. *Дзімітроў*. У 1946 Нар. сход прыняў законы аб працоўнай зямельнай уласнасці, прагрэсіўна-падаходным падатку і інш. 10.2.1947 падпісаны мірны дагавор з Б. (гл. *Парыжскія мірныя дагаворы 1947*). Рашучая падтрымка СССР, УССР, БССР памагла Б. захаваць нац. незалежнасць (дэлегацыя БССР удзельнічала ў Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946; міністр замежных спраў БССР К. В. Кісялёў быў старшынёй камісіі па паліт. і тэрытарыяльных пытаннях праекта мірнага дагавору з Б.).

4.12.1947 Вялікі нар. сход прыняў новую канстытуцыю. Паводле яе ў канцы снеж. 1947 нацыяналізаваны прыватныя прадпр. і банкі, уведзена дзярж. манаполія на знешні і ўнутраны аптовы гандаль. 18.3.1948 заключаны сав.-балг. Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе. Аналагічныя дагаворы Б. падпісала і з інш. сацыяліст. краінамі. У снеж. 1948 V з'езд БКП прыняў праграму разгорнутага сацыяліст. буд-ва. За 1-ю (1949—53) і 2-ю (1953—57) пяцігодкі дасягнуты вялікія поспехі ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры. VII з'езд БКП (1958) адзначыў, што сацыялізм перамог ва ўсіх галінах нар. гасп. У рашэннях VIII з'езду (1962) прадугледжвалася завяршыць стварэнне матэх. базы сацыялізма і забяспечыць умовы для паступовага пераходу да буд-ва камунізма. У выніку завяршэння 3-й і 4-й пяцігодак, выканання 5-й (1966—70) дасягнуты новыя поспехі ў развіцці нар. гасп. краіны. Умацавалася міжнар. становішча Б. У 1969 яна падтрымлівала дыпламат. адносіны з 80 дзяржавамі, а гандлёвыя з 111. З снеж. 1955 член ААН. Б.— неад'емная частка сусв. сацыяліст. садружнасці, член *Савета эканамічнай узаемадапамогі* (з 1949), удзельніца (з мая 1955) *Варшаўскага дагавору 1955*. У Сафіі 12.5.1967 падпісаны новы Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж НРБ і СССР.

Значны ўклад ва ўмацаванне сав.-балг. дружбы працоўных Беларускай ССР. Больш за 50 бел. прадпрыемстваў пастаўляюць Б. сваю прадукцыю (аўтамашыны, трактары, станкі, камбайны, меліяратыўную тэхніку, шарыкападшыпнікі, гадзіннікі і г. д.). Шмат прамысл. вырабаў і тавараў шырокага ўжытку ўвозіцца з Б. ў БССР (аўта- і мотакары, электраабсталяванне, футравыя і швейныя вырабы, медыкаменты, свежая і кансерваваная садавіна і г. д.). У 1968 БССР удзельнічала ў міжнар. кірмашы ў Плоўдзіве. Абменьваюцца вопытам працоўныя Магілёўскай вобл. БССР і Габраўскай акругі Б. У 1966 падпісана пагадненне аб навук. супрацоўніцтве паміж Беларускім і Сафійскім ун-тамі. У вер.—кастр. 1965 адбыліся дэкады балг. культуры ў БССР і бел. культуры ў Б. 30.5.1961 створана Бел. аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы.

Палітычныя партыі, Айчынны фронт і грамадскія арганізацыі. *Балгарская камуністычная партыя* (БКП), засн. ў 1891, 611 179 чл. (1966). Першы сакратар ЦК Т. *Жыўкаў*. Балгарскі земляробчы народны саюз (БЗНС), засн. ў 1899, 120 тыс. чл. Саюзнік БКП, актыўна ўдзельнічае ў будаўніцтве сацыялізма. Айчынны фронт (АФ), масавая грамадска-паліт. арг-цыя. Засн. па ініцыятыве БКП у 1942, больш за 3800 тыс. чл. (1969). У АФ як калект. члены ўваходзяць БКП, БЗНС, Дзімітроўскі камуніст. саюз моладзі, прафсаюзы. Прафесіянальныя саюзы, 2,4 млн. чл. Дзімітроўскі камуністычны саюз моладзі (да 1958 Дзімітроўскі саюз народнай моладзі), засн. ў снеж. 1947, 1050 тыс. чл. Камітэт балгарскіх жанчын (засн. ў 1945). Балгарскі нацыянальны камітэт абароны міру (засн. ў 1949). Усенародны камітэт балгара-савецкай дружбы. Славянскі камітэт Балгарыі (засн. ў 1945).

Народная гаспадарка. За гады. нар. улады Б. ператварылася ў індустрыяльна-аграрную дзяржаву з развітай прамысл. і буйной кааперыраванай с. гасп. У 1947—65 Б. атрымала ад СССР доўгатэрміновыя крэдыты на 1,5 млрд. рублёў. ⅔ увезеных у Б. машын і абсталявання паступілі з СССР. З тэхн. дапамогаю СССР пабудавана 90 прамысл. і інш. аб'ектаў. Удз. вага прамысл. ў агульнай прадукцыі складае больш за 80%. Аб'ём прамысл. прадукцыі ў 1968 перавысіў узровень 1939 у 30 разоў. Аснову паліўна-энерг. балансу складаюць лігніт, буры і кам. вугаль (здабыта 30,9 млн. *т* у 1968 супраць 2,2 млн. *т* у 1939). Гал. басейны: Усх.-Марыцкі, Перніцкі, Бабаўдольскі, Дзімітроўскі, Чарнаморскі. У 1968 выпрацавана эл. энергіі 15,5 млрд. *кват·гадз* супраць 266 млн. *кват·гадз* у 1939. Найбуйнейшыя эл. станцыі ва Усх.-Марыцкім бас.



(Марыца-Усход I, Марыца-Усход II). Буйныя ЦЭЦ у Сафіі і Дзімітраўградзе. ГЭС даюць каля 1/4 усёй эл. энергіі, асноўныя на Пд. Развіваецца металургічная прамысловасць (з-д імя Леніна каля г. Пернік і з-д паблізу ад Сафіі ў Крамікаўцах). У 1968 атрымана 1081 тыс. *т* чыгуну і ферасплаваў, 1461 тыс. *т* сталі. Да 2-й сусв. вайны на душу насельніцтва ў год прыпадала 900 *г* металу, у 1968 — 172 *кг*. Каляровая металургія — адна з найбольш перспектыўных галін нар. гасп. На базе свінцова-цынкавых рудаў Усх. Радопаў (Мадан, Рудазем) працуюць свінцова-цынкавыя з-ды ў Кырджалі і Плоўдзіве. У Злаціцы меднаабагачальны камбінат «Медэт», медзеплавільны камбінат «Г. Дамянаў». Каляровая металургія дае нар. гасп. 229,8 тыс. *т* (20-працэнтнага) меднага, 133,1 тыс. *т* (70-працэнтнага) свінцовага, 135,7 тыс. *т* (52-працэнтнага) цынкавага канцэнтратаў (1968). Паводле міжнар. сацыяліст. падзелу працы Б. спецыялізуецца па вытворчасці некат. відаў падымальна-транспартных машын, абсталявання для харчова-смакавай прамысловасці. У 1967 выпушчана 23 тыс. электракараў і 35 тыс. электратэльферaў. Вырасла трактарная (Карлава, станкабудаўнічая і электратэхнічная (Сафія), суднабудаўнічая (Варна, Бургас), аўтамабільная (Шумен, Ловеч, Плоўдзіў) прамысловасць. У 1939 машынабудаванне ў агульнай прамысл. вытворчасці склала 0,3%, у 1967 — 18,7%. Хім. прамысл. добра забяспечана мясцовай сыравінай (вугаль, соль, пірыты). Вытворчасць мінер. угнаенняў (камбінат мінер. угнаенняў у Дзімітраўградзе, азотнатукавы з-д у Стара-Загоры), сернай к-ты (на базе комплекснага выкарыстання рудаў каляровых металаў); кальцыніраванай соды, сінт. валакна, фарбаў, дубільных экстрактаў. У 1968 атрымана азотных угнаенняў 1323 тыс. *т*, сернай к-ты (монагідрат) 471 тыс. *т*, соды кальцыніраванай (98-працэнтнай) 229 тыс. *т*. У Бургасе нафтаперапр. з-д. Развіта прамысловасць буд. м.— вытворчасць цэменту (3,6 млн. *т*, 1969), цэглы, матэрыялаў блочнага буд-ва. Лёгкая і харч. прамысловасць дае каля паловы ўсяго аб'ёму прамысл. прадукцыі. У лёгкай гал. месца займае тэкстыльная (Сафія, Габрава, Плоўдзіў, Слівен, Варна), гарбарная, дрэваапрацоўчая. Выраблена 344 млн. $м^2$ тканіны і 19 млн. пар абутку (1968). У харчовай — мяса-малочная, кансервавая, тытунёвая (Плоўдзіў), цукровая, вінаробная. У 1968 атрымана пладова-агародніннных кансерваў 414 тыс. *т*, цукру 288 тыс. *т*, у 1967 — вінаграднага віна 237 млн. *л*. Карлава — цэнтр вытворчасці рулжавага алею. Б. першая з замежных сацыяліст. краін кааператывала с. гасп. (у 1968 было 866 працоўных земляробчых гаспадарак і 151 дзяржгас). Сацыяліст. сектар дае больш за 99% валавой прадукцыі с. гасп. Аб'ём с.-г. прадукцыі перавысіў даваенны ўзровень больш чым у 3 разы, хоць колькасць занятых у с. гасп. зменшылася ўдвая. У 1968 у кааператывах і дзяржгасах працавала 75,6 тыс. трактароў (у 15-сільным вылічэнні), 14,5 тыс. камбайнаў, каля 20 тыс. грузавых аўтамабіляў. Арашаецца каля 1 млн. *га* (1968). 2/3 усёй прадукцыі дае раслінаводства. Гал. культуры пшаніца і кукуруза, развіта вінаградарства (Дунайская раўніна і ПдУ). У 1968 сярэдняя ўраджайнасць пшаніцы 23,9 *ц/га* супраць 15 у 1939. Тэхн. культуры займаюць каля 14% пасяўной плошчы. Цукр. буракі і сланечнік вырошчваюць на Пн. Тытунь, бавоўнік, канопкі, ружы, а таксама агародніну (памідоры, перац, баклажаны) у катлавінах сярэдняй і паўд. частках краіны. Тут на вялікіх плошчах сады. Б. займае 1-е месца ў свеце па экспарце сталовага вінаграду. У 1968 буйн. раг. жывёлы было 1,4 млн. галоў, свіней 2,5 млн., авечак 9,9 млн. У горных раёнах гал. ч. экстэнсіўная пашавая жывёлагадоўля мяснога кірунку, авечкагадоўля, гадоўля коз, аслоў, мулаў; на Пн буйн. раг. жывёла, пераважае мяса-малочны кірунак, гадуюць коней і буйвалаў, развіта свіна- і птушкагадоўля. Даўж. чыгунак (1967) 4158 *км*, з іх 522 *км* электрыфікаваны. У знешнім гандлі значная роля марскога флоту. Гал. марскія порты Бургас і Варна, гал. порт на Дунаі — Русе. Сафія звязана авіяц. лініямі з вялікімі гарадамі краіны, сталіцамі сацыяліст. краін і з Венай. Б. гандлюе больш як з 100 краінамі. На сацыяліст. краіны прыпадае больш як 3/4 тавараабароту (у 1967 — 75,6%, у т. л. на СССР 51,2%). Прамысл. тавары складаюць 85% балг. экспарту, у т. л. каля 30% машыны і абсталяванне. Б. экспартуе фруктовыя і агародніянныя кансервы, тытунёвыя вырабы, руды і канцэнтраты каляровых металаў. Імпартуюцца машыны і абсталяванне, сыравіна і паліва. Адна з важных крыніц даходаў краіны — замежны турызм (1749 тыс. чал., 1967). Грашовая адзінка — леў.

Узброеныя сілы Б. складаюцца з сухап. войск, ВПС, ВМФ, войск ППА і пагранічных войск. Балг. Народная армія (БНА) узброена ракетнай, артыл., аўтабранятанкавай, авіяцыйнай, радыёлакацыйнай і інш. ваен. тэхнікай. З часу арг-цыі Варшаўскага дагавору БНА актыўна ўдзельнічае ў сумесных мерапрыемствах па ўмацаванні магутнасці аб'яднаных узбр. сіл.

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя дзяржаўная, бясплатная з 1951. У 1965 на яе асігнавана 183,6 млн. левaў. У 1967 была 291 бальнічная ўстанова на 54 709 ложкаў, 57 дыспансераў. Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі ў 1967 — 7,0 на 1000 чал. насельніцтва. Урачоў усіх спецыяльнасцей у 1967 было 14 475 чал. (17 урачоў на 10 тыс. чал. насельніцтва), фельчараў 4487, акушэрак 4996, мед. сясцёр 21 743. Рыхтуюць урачоў мед. ін-ты ў Сафіі, Плоўдзіве, Варне. У 1967 на раджальнасць складала 15,9, смяротнасць 9 на 1000 чал. насельніцтва. Сярэдняя працягласць жыцця 70 гадоў.

Народная асвета, культурна-асветныя ўстановы. Закон пра абавязковае пач. навучанне ў Б. быў прыняты ў 1880, але неўзабаве балг. буржуазія дамаглася закону, які абмежаваў доступ у навуч. ўстановы дзяцей рабочых і сялян. У 1944 каля 30% нас. Б. было непісьменнае.


Пасля ўстанаўлення народнай улады ўведзена абавязковае і бясплатнае васьмігадовае навучанне. Сістэма нар. адукацыі: дзіцячыя сады для дзяцей 3—7 г.; асн. васьмігадовая школа для дзяцей 7—16 г.; поўная сярэдняя школа (політэхн. гімназія) з 3-гадовым навучаннем на базе васьмігадовай школы; прафесійна-тэхн. вучылішчы з тэрмінам навучання 2—3 г. і тэхнікумы з 4-гадовым навучаннем (на базе 8-гадовай школы). У 1968 было 8275 дзіцячых садоў (335 772 дзіцяці).



1



2




3



4



5



6

Балгарыя I.

1. Краявід на захадзе Стара-Планіны.
2. Сафія. Храм-помнік «Аляксандр Неўскі», пабудаваны ў гонар Вызваленчай руска-турэцкай вайны 1877—78.
3. Плоўдзіў. Помнік балгарска-савецкай дружбы.
4. У цэнтры Сафіі.
5. Вёска Траянава. Цэнтральная плошча.
6. Металургічны камбінат «Крамікаўцы».
7. Збор ружаў.
8. На тытунёвым полі даследчай станцыі ў вёсцы Джэбел.



7



8


1


2



3


4


5


6


7


8


9

Балгарыя II. 1. Царква ў с. Баяна каля Сафіі. 11—13 ст. 2. Унутраны двор Рыльскага манастыра. 1816—60. 3. Курорт «Залатыя пяскі» каля Варны. 50-я г. 20 ст. 4. Роспіс Казанлыкскай пахавальні. 4—3 ст. да н. э. 5. Княгіня Дэсіслава. Фрагмент роспісу царквы ў с. Баяна. 1259. 6. І. Фуневў. У вагоне трэцяга класа. 1935. 7. Х. Станчаў. На ніве. 1936. 8. І. Пятроў. Расстрэл. 1938. 9. С. Веневў. Першы трактар.

У 1967/68 навуч. г. працавала 1523 пач. школы (548 697 вучняў), 77 прагімназій, 2987 васьмігадовых школ (536 523 вучні), 234 поўныя сярэднія школы і гімназіі (97 903 вучні), 60 вячэрніх агульнаадук. школ (26 309 вучняў), 35 аздараўленчых і 112 спец. школ, 321 прафесіян.-тэхн. вучылішча (99 793 навучэнцы), 244 тэхнікумы (162 969 навучэнцаў), 9 маст. вучылішчаў. У 1967/68 навуч. г. ў 30 ВНУ займалася 85 270 студэнтаў. Старэйшая ВНУ Б.— Сафійскі ун-т (засн. ў 1888). У краіне 144 музеі, 11 047 б-к (1969), самая вялікая Нар. б-ка Кірыла і Мяфодзія.

Друк, радыё, тэлебачанне. У Б. (1967) 12 штодзённых газет і каля 500 інш. перыяд. выданняў. Найпажнейшыя газеты: «Работническо дело» — орган ЦК БКП, «Отечествен фронт» — орган Прэзідыума Нар. сходу і Нац. Савета Айч. фронту, «Земеделско знаме» — орган Балг. земляробчага нар. саюза, «Труд» — орган Цэнтральнага Савета прафсаюзаў, «Народна младеж» — орган ЦК Дзімітроўскага камуніст. саюза моладзі і інш. Тэарэт. часопіс ЦК БКП «Ново време». Асн. крыніца інфармацыі — Балг. тэлегр. агенцтва (БТА). У 1967 працавала 18 радыёстанцый і 4 тэлецэнтры.

Навука. Стварэнне славянскай азбукі Кірылам і Мяфодзіем спрыяла развіццю навук. думкі ў Б. ў 2-й пал. 9 ст.

У гады тур. прыгнёту (1396—1878) развіццё яе стрымлівалася. Новае развіццё навук. думкі пачалося ў эпоху нац. адраджэння. У 1-й пал. 19 ст. пачынаюць фарміравацца некат. галіны балг. навукі: гістарыяграфія, моваznаўства, геаграфія, біялогія, медыцына. На развіццё балг. навукі плённы ўплыў мелі працы рус. вучоных. Першыя балг. ўрачы атрымлівалі адукацыю пераважна ў Расіі. З'яўляюцца працы па балг. этнаграфіі (рус. філолаг і гісторык Ю. Вянелін), гісторыі [М. Дрынаў; К. Ірачак, чэшскі вучоны, напісаў «Гісторыю балгар» («История на българите»), 1870], моваznаўстве, прыродазнаўстве і медыцыне. У 1869 у Брэіле (Румынія) засн. Балг. т-ва прыгожага пісьменства, якое пасля вызвалення Б. ад турэцкай няволі перамясцілася ў Сафію, у 1911 перайменавана ў *Балгарскую акадэмію навук* (БАН). Навук. даследаванні вяліся пераважна ў Сафійскім ун-це і некат. ведамасных ін-тах і лабараторыях. Балг. навука дасягнула поспехаў у галіне матэматыкі (К. Папоў, Н. Абрэшкаў, І. Цэнаў, Л. Чакалаў), фізікі (Г. Наджакаў, адкрыў фотаэлектрэтны стан рэчыва, 1937), біяхіміі (А. Златараў), фізіка-хіміі (школа І. Н. Странскага і Р. Каішава, якія стварылі колькасную тэорыю зараджання і росту крышталяў), біялогіі (рус. фізік і біёлаг П. І. Бахмецьеў, працаваў у Б., першы растлумачыў з'яву анабіёзу; М. Папоў, стварыў тэорыю стымуляцыі раслін). Як даследчыкі сталі вядомыя Г. Златарскі (геолаг), А. Ішыркаў (географ), С. Юрыніч (заолаг), Н. Стаянаў (батанік), Д. Костаў (генетык), К. Пашаў (урач-афтальмолаг), В. Златарскі (гісторык), Г. Кацараў (гісторык і археолаг), А. Тэодараў-Балан, Л. Мілеціч, С. Младзянаў (моваznаўцы). Дз. *Благоеў* у канцы 19 ст. залажыў асновы балг. марксісцкай тэарэт. думкі. Развіваецца балг. марксісцкая філасофія (Т. Паўлоў зрабіў важны ўклад у развіццё ленінскай тэорыі адлюстравання; С. Ганаўскі).

Шырока разгарнулася навук. дзейнасць у Б. пасля ўсталявання нар.-дэмакр. улады. Колькасць навук. кадраў (з 1944) павялічваецца прыблізна праз кожныя 6 гадоў удвая. Навук. даследаванні сканцэнтраваны ў БАН (рэарганізавана ва ўстанову з уласнымі даследчымі звеннямі), Акадэміі с.-г. навук (засн. ў 1961), ведамасных н.-д. і праектна-канструктарскіх ін-тах і лабараторыях, у ВНУ. Навук. дзейнасць каардынуе Дзярж. камітэт па навуцы і тэхн. прагрэсе (на правах мін-ва). За гады нар.-дэмакр. улады зроблены пэўны ўклад у матэматыку (Н. Абрэшкаў, Л. Іліеў), геафізіку (Л. Крыстанаў), хім. навукі (Р. Каішаў і Е. Будзеўскі, даследаванні па электракрышталізацыі металаў; А. Шалудко, тэрмадынаміка і кінетыка тонкіх цякучых слаёў; С. Хрыстаў стварае метад патэнцыяльных бар'ераў у кінетыцы хім. і фіз. працэсаў), біял. навукі (створана матэм. мадэль рэгуляторных механізмаў клетачнага дзялення — Р. Цанеў, біяхімік; Б. Сендаў, матэматык), мед. навукі (даследаванні па рэгенерацыі спіннога мозгу, эпілепсіі, дыябеце), с.-г. навукі (пераважна ў раслінаводстве і селекцыі, Х. Даскалоў), тэхн. навукі (А. Балеўскі і І. Дзімаў стварылі арыгінальны метад ліцця з проціціскам), філасофію (Т. Паўлоў і яго школа), эканам. навукі (Е. Матэеў — эканам. кібернетыка), моваznаўства (У. Геаргіеў — індаеўрап. моваznаўства).

Літаратура балгарская — адна з найбольш стараж. слав. л-р — узнікла ў 2-й пал. 9 ст.

Першыя творы мелі царк.-дыдакт. характар. Клімент Охрыдскі, Іаан Экзарх, Чарнарызец Храбр — вучні слав. асветнікаў Кірыла і Мяфодзія — адстойвалі права славян на сваю пісьменнасць. У 10—13 ст. пашырыліся багамільскія жыціі святых, апокрыфы, паданні і легенды. Яны процістаялі афіц. царк. л-ры і выказвалі погляды нар. мас. Прадстаўнікі свецкай л-ры сярэдневякоўя — Феадосій і Яўфімій Тырнаўскія, Кіпрыян і інш. У жыційнай л-ры 13—14 ст. выявіліся нар. і патрыят. матывы. Грыгорый Цамблак і Канстанцін Касцянецкі, сведкі тур. заваявання Б., паказалі ў сваіх творах пакуты народа пад уладай іншаземцаў. Гэтую тэму распрацоўвалі Уладзіслаў Граматык (15 ст.), Поп Пейо і Матэй Граматык (16 ст.). У змрочныя стагоддзі тур. панавання духоўнае жыццё балг. народа адлюстроўвалася ў т. зв. дамаскінах (аб. павучанняў, аповесцей і паданняў, напісаных на ўзор твораў грэч. епіскапа 16 ст. Дамаскіна Студыта) і ў фальклоры — юнацкіх, гайдуцкіх і гістар. песнях, баладах, легендах і казках. У 2-й пал. 18 ст. пачалося балг. адраджэнне (працы Паісія Хілендарскага, Сафронія Урачанскага). У 30—40-я г. 19 ст. працавалі выдатныя дзеячы балг. адраджэння П. Бярон, В. *Апрылаў*, Неафіт Рылскі, К. Фоцінаў, Э. Васкідавіч і Н. Гераў, які ўвёў у балг. паэзію сілабатанічнае вершаскладанне. З уздымам нац.-вызв. барацьбы (50—70-я г.) паявілася рэвалюц.-рамант. паэзія (Д. Чынгулаў, П. Р. *Славейкаў*, Г. С. *Ракоўскі*, Н. Козлеў). Развіццё рэалізму звязана з найвышэйшым этапам нац.-вызв. руху 60—70-х г. (Л. *Каравелаў*, П. Р. Славейкаў, Х. *Боцеў*). Узмацнілася ўздзеянне перадавой рус. культуры. Пасля рус.-тур. вайны 1877—78 і вызвалення Б. росквіту дасягнуў крытычны рэалізм (І. *Вазаў*, З. Стаянаў, С. Міхайлоўскі, А. Канстанцінаў, Г. Стаматаў). У канцы 90-х г. узнікла пралетарская л-ра і марксісцкая эстэтыка (Дз. *Благоеў*, Дз. Палянаў, Г. *Кіркаў*). Супярэчлівая творчасць найбуйнейшых паэтаў пач. 20 ст. П. П. *Славейкава* і П. Яварава мела асобныя рысы мадэрнізму. Прадстаўнікамі сімвалізму былі Т. Траянаў, Н. Райнаў, Н. Ліліеў, Л. *Стаянаў*, Х. Ясенаў, Г. Мілеў.

У пач. 20-х г. выступіў пачынальнік сацыяліст. рэалізму ў балг. л-ры Х. *Смірненскі*. У 20—30-я г. творчасць Палянава, Смірненскага, *Эліна Пяліна*, П. *Поўкава*, А. Каралійчава, С. Загарчынава, Н. Хрэлкава, Стаянава, Г. *Караславава*, Х. Радзеўскага, А. Васілева, Н. *Вапцарава*, А. *Страшымірава* характарызавалася дэмакр. накіраванасцю, антыфаш. тэматыкай, барацьбой супраць прыхільнікаў «чыстага мастацтва». У 20—40-я г. вялікі ўклад у развіццё марксісцкай літ. крытыкі зрабілі Г. *Бакалаў* і Т. *Паўлоў*. У час фаш. акупацыі загінулі паэты Вапцараў, Ц. Спасаў і Х. Кырпачаў — удзельнікі Супраціўлення. Пасля ўстанаўлення нар.-дэмакр. ладу пісьменнікі адлюстроўваюць буд-ва сацыялізм-


ма ў НРБ, па-новаму асвятляюць гістар. мінулае: раманы «Тытунь» Дз. *Дзімава*, «За свабоду» С. Дзічава; эпапея «Звычайныя людзі» Караславава; гістар. тэтралогія Д. Талева — «Жалезны свяцільнік», «Прэспанскія званы», «Ільёў дзень», «Чуем вашы галасы»; тэтралогія «Шлях» С. Даскалова; «Сям'я ткачоў», «Два ў адным горадзе» К. Калчава; «Каханне», «Залатое руно» А. Гуляшкі; «Іван Кондараў» Э. *Станева*; аповесці П. *Вежынава*; вершы і паэмы Э. *Багряны*, М. Ісаева, Ламара, Сталянава, А. Далчава, В. Ханчава, Б. Бажылава, А. Герава; драмы А. Васілева, К. Зідарава, І. Пейчава, Т. Генава, К. Кюляўкава. У л-ру прыйшлі паэты Г. Джагараў, Б. Дзімітрова, П. Мацеў, І. Давыдкаў, П. Стэфанаў, А. Арлінаў, П. Пеневў, А. Сталянаў, Л. Леўчаў, Д. Дамянаў, У. Башаў, С. Караславаў; празаікі Н. Хайтаў, Г. Стоеў, Д. Фучаджыеў, А. Дончаў, Г. Мішаў, Т. Монаў. У маі 1968 адбыўся 1-ы з'езд балг. пісьменнікаў. Сучасная балг. л-ра імкнецца да шырокага ахопу рэчаіснасці, што выявілася ў інтэнсіўным развіцці прозы, асабліва рамана. У вершах і драмах наглядаецца пільная ўвага да ўнутр. свету новага героя — будаўніка сацыялізма.

Бел.-балг. літ. сувязі пачаліся ў паслякастр. перыяд (20—30-я г.), калі ў балг. перыёдыцы з'явіліся артыкулы пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, М. Чарота, А. Аляксандровіча, а ў бел. час. «Полымя», «Узвышша», «Маладняк» вершы Боцева, Смірненскага, Н. Ланкава, Кюляўкава, артыкулы Бакалава, З. Снежкі. На бел. мове выйшлі «Бай Ганю» Канстанцінава, «Чотнікі» М. Марчэўскага, К. Парванава і С. Лілянава. У 50—60-я г. на бел. мове апублікаваны раманы «У ярме» Вазава, «МТ станцыя» Гуляшкі, «Свая зямля» Даскалова, «Нявестка» Караславава, аповесці «Сляды застаюцца» Вежынава, «Закаханыя птушкі» Калчава, кн. лірыкі Н. *Вылчава* «Белая чайка», зб. сучаснай балг. паэзіі «Ад стром балканскіх», апавяданняў «Скарб», вершаў для дзяцей «Чарадзейны ліхтарык», балг. нар. песень, казак. З артыкуламі пра балг. л-ру выступілі Н. Гілевіч, Л. Цімашкова, В. Цімафеева. У НРБ выдадзены зб. вершаў Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, А. Вялюгіна, Гілевіча, трылогія Я. Коласа «На ростанях», раманы І. Шамякіна «Глыбокая плынь» і «Сэрца на далоні», зб. апавяд. Я. Брыля, аповесці В. Быкава, п'есы А. Макаёнка і А. Маўзона, зб. «Беларускія апавяданні». Асн. перакладчыкі бел. л-ры ў НРБ Н. Вылчаў, Давыдкаў, А. Германаў, Стэфанаў, Г. Вылчаў, Х. Бербераў; на бел. мову творы балг. пісьменнікаў перакладаюць Гілевіч, В. Нікіфаровіч і інш.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Стараж. помнікі мастацтва на тэр. Б. (гліняныя статуэткі, посуд з геам. арнаментам) адносяцца да эпохі неаліту; ад перыяду бронзы захаваліся наскальныя малюнкі ў пячоры Магура каля Відзіна. У 7—6 ст. да н. э. узніклі грэч. гарады-калоніі, у 1—2 ст. рымскія паселішчы. З 4 ст. на тэр. Б. развіваецца візант. культура. Да 8 ст. адносіцца адзін з першых помнікаў балг. мастацтва — велічны наскальны рэльеф «Мадарскі коннік». З 11 ст. базілікальныя і крыжова-купальныя цэрквы ў Тырнаве, Несебыры, Асенаўградзе і інш. ўпрыгожваліся дэкар. дэталямі і манумент. рэліг. жывапісам (роспісы Баянскай царквы). Высокага ўзроўню дасягнулі ювелірная справа, кераміка. У перыяд балг. Адраджэння ў гарадах будаваліся майстэрні, крамы, гадзіннікавыя вежы, мастакі склаўся характэрны тып двухпавярховага жылога дома з адкрытай галерэяй, вонкавай лесвіцай. У царк. жывапісе ўзмацніліся свецкія тэндэнцыі, пашырыўся станковы партрэт (мастакі З. Зограф, Н. Паўлавіч, С. Даспеўскі і інш.). Уздым рэалістычнага мастацтва Б., які пачаўся ў 90-я г. 19 ст., звязаны з творчасцю жанрыста І. *Мырквічкі*, баталіста Я. Вешына і інш. Рашаць пластычныя задачы пачалі ў 20-я г. 20 ст. жывапісцы У. Дзімітроў-Майстара, А. Мутафаў, скульптар А. Ніколаў. Жыццё пралетарыяту прысвечаны ў 30-я г. работы мастакоў С. Венева, Х. Станчава, Б. Ангелушава, скульптара І. *Фунева*. Маст. жыццё Б. характарызуецца імкненнем старэйшага і маладога (С. Русеў, Е. Томаў, М. Парпулава, І. К'ёсеў і інш.) пакаленняў мастакоў адлюстраваць сучаснасць на аснове глыбокага асэнсавання жыццёвага матэрыялу. Інтэнсіўна развіваецца архітэктура: паводле новых планаў забудоўваюцца вялікія гарады, створаны новыя прамысл. цэнтры (Дзімітраўград), курортныя комплексы: «Залатыя пяскі» (арх. Г. Гінеў і інш.), «Сонечны бераг» (арх. Н. Ніколаў і інш.). У прыкладным маст. (кераміка, тканіны, дываны, разьба па дрэве) сучасныя маст. прынцыпы спалучаюцца з нар. традыцыямі.

Музыка. Балг. нар. музыка багатая на жанры, своеасабліва паводле ладавай будовы (дыятанізм спалучаецца з характэрнымі ўсх. ладамі з павялічанай секундай) і рытміцы (асабліва ў танц. і карагодных песнях — ручаніцах і хора). Нар. муз. інструменты: гайда (дуда), гадулка (смычковы), кавал (духавы) і інш. Прафесійн. муз. культура спрадвечнакоўя звязана з царквой. У 14 ст. выпрацаваўся царк. кампазітар Іаан Кукузель, вынаходнік новага нотнага пісьма («кукузелавы неўмы»). Гарадская свецкая муз. культура развіваецца пасля вызвалення Б. ад тур. прыгнёту. У канцы 19 — пач. 20 ст. кампазітары Э. Манолаў, А. Букарашліеў, П. Піпкаў, Г. Атанасаў, Д. *Хрыстаў* працуюць у дамакр. жанрах сольнай і харавой песні. Першыя оперы ствараюцца ў 1900—10 Манолавым, І. Івановым і В. Кауцкім, Атанасавым, першыя сімф. творы — Хрыставым і Н. Атанасавым. У 1908 вядомыя спевакі К. Міхайлаў-Сталін, Д. Казакаў, І. Вульпе і С. Македонскі арганізоўваюць Балг. оперны т-ва (з 1921 Сафійская нар. опера). Росквіт муз. мастацтва В. пасля ўсталявання нар.-дэмакр. ладу. Кампазітары С. Абрашева, М. Галемінаў, Б. Іканомаў, Ф. Кутеў, Л. Піпкаў, П. Стайнаў, В. Сталянаў, П. *Уладзігераў* і інш., дзейнасць якіх пачалася яшчэ ў перыяд да 9 верасня 1944, стварылі багатую оперную, сімф. і камерную л-ру. Вылучыліся спевакі Н. Афеня, Х. Брымбараў, Н. Гяураў, Н. Карава, Н. Ніколаў, І. Папова, П. Райчаў, Дз. Узунаў, Б. Хрыстаў і інш., скрыпачы У. Аўрамаў, Э. Камілараў, Б. Лечаў, піяністка М. Малова, дырыжоры К. Іліеў, А. Найдзенаў, Р. Райчаў. У Б. 5 оперных тэатраў, муз. тэатр імя Македонскага, 5 сімф. аркестраў, ансамблі песні і танца, муз. акадэмія, ін-т музыкі ВАН.

Тэатр. Вытокі балг. т-ра ў нар. гульнях, асабліва ў «кукерах». У 40-я г. 19 ст. ствараюцца аматарскія гурткі ў школах, нар. чытальнях. Пачатак балг. т-ра адносяць да 1856, калі ў Ломе і Шумене адбыліся першыя публічныя тэатр. паказы. У 1866 Д. П. Войнікаў заснаваў пастаянную балг. трупу ў Бэйле (Румынія). Пасля вызвалення Б. ад тур. прыгнёту ўзнік балг. прафесійн. т-р (першая трупа ў Плоўдзіве, 1883). У 1887 заснавана «Плоўдзіўская аматарская трупа», з 1883 працуе ў Сафіі як драм. трупа «Аснова». У 1892 на базе яе створана драм. дзярж. трупа «Сляза і смех» (з 1904 Нар. тэатр імя Вазава). Яна адыграла важную ролю ў развіцці нац. драматургіі (ставіліся п'есы І. Вазава, В. Друмева, А. Страшымірава і інш.). 1904—12 — перыяд уздыму балг. т-ра. Сфарміравалася рэаліст. акцёрскае мастацтва, заснавальнікамі якога былі выхаванцы рус. тэатр. школ — А. *Будзейская*, К. Сарафаў, Г. Кірчаў, А. Кірчаў, Х. Ганчаў, таксама В. Кіркаў, І. Папоў, С. Агняноў, С. Бычварaў. Развіццю рэалізму



Н. Гяураў у ролі Барыса Гадунова ў аднайменнай оперы М. Мусаргскага. Сафійская народная опера (злева). Народныя гульні «кукеры».

ў балг. т-ры садзейнічала творчасць б. акцёра МХАТа М. Масаліцінава (у 1925—44 гал. рэж. Нар. тэатра ў Сафіі), акцёраў У. Трандафілава, І. Дзімава, К. Кісімава, П. Атанасава, Г. Стаматава, З. Парданавай, П. Герганавай. Пасля 2-й сусв. вайны ставіцца многа твораў замежных драгэс. аўтараў, рус. класічныя і сав. п'есы, развіваецца нац. драматургія. У 1948—50 Нар. т-р імя Вазава ставіў п'есу бел. драматурга А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў». Сучаснае пакаленне балг. акцёраў: С. Гецаў, Р. Далчава, М. Дупарынава, Г. Калаянчаў, А. Караміцеў, Т. Масаліцінава, М. Паўлова; рэжысёры: Б. Данoўскі, Ф. Філіпаў, К. Мірскі, С. Сырчаджыеў і інш. У Б. (1969) 39 т-раў. Нар. тэатр імя Вазава гастраліраваў у СССР (1963).

Кіно. З 1910 пачаліся здымкі дакумент. і хранік. фільмаў, з 1915 — мастацкіх. Ставіліся кінакамедыі, меладрамы перайманьнага характару. У 1939 створана дзярж. кінафірма. Яна выпускала пераважна прафашысцкія фільмы. Новы этап у развіцці балг. кіно пачаўся пасля 1944. Пашырыліся сувязі з кінематаграфіямі замежных краін, з'явіліся сумесныя фільмы: сав.-балг. — «Героі Шыпкі» [прэмія на 8-м Міжнар. кінафестывалі (Мкф) у Кане, 1955], «Першы кур'ер» (1968); з кінадзеячамі ГДР — «Зоркі» (прэмія на 12-м Мкф у Кане, 1959) і інш. Фільмы апошніх гадоў: «Якія маладыя мы былі» (Залаты прыз на 2-м Маск. Мкф, 1961), «Сонца і цень» (прэмія на 13-м Мкф у Карлавых Варах, на Мкф у Сан-Францыска, 1961), «Паланёная чарада» (1962), «Канец «Нікаціяны» (1963), «Выкрадальнік персікаў» (1964), «Інспектар і ноч» (1964), «Адхіленне» (Залаты медаль на 5-м Маск. Мкф, 1967). Развіваецца дакументальнае, навук.-папулярнае (з 1945) і мультыплікацыйнае (з 50-х г.) кіно. У 1952 арганізавана Студыя маст. фільмаў. З 1961 у Варне штогод наладжваецца фестываль балг. фільма. Сярод кінарэжысёраў — З. Жандаў, В. Шаралieў, Б. Жалязкава, Р. Вылчанаў, В. Радзеў.

Літ.: Ленін У. І. Балканскія народы і еўрапейская дыпламатыя, Тв., т. 18 (Поли. собр. соч., т. 22); Ягo ж. Сацыяльнае значэнне сербска-балгарскіх перамог, там жа (Поли. собр. соч., т. 22); Ягo ж. Балканская вайна і буржуазны шавінізм, там жа, т. 19 (Поли. собр. соч., т. 23); Димитров Г. М. Избранные произведения, т. 1—2, М., 1957; Живков Т. Избранные статьи и речи, т. 1—2, М., 1964—65; Валев Л. Б. Болгарский народ в борьбе против фашизма, М., 1964; История Болгарии, т. 1—2, М., 1954—55; История на България, 2 изд., т. 1—3, София, 1961—64; Братская дружба, всестороннее сотрудничество, М, 1969; Четверть века народной Болгарии, М., 1969; Мельцер Д. Социалистической Болгарии — 20 лет, Мн., 1964; Пенков И. и Христов Т. Икономическа география на България, 2 изд., София, 1965; Мировая социалистическая система хозяйства, т. 4, М., 1967, с. 38—61; История на българската литература в 4-х т., т. 1—2, София, 1963—66; Очерки истории болгарской литературы XIX—XX в., М., 1959; Марков Д. Ф. Болгарская поэзия первой четверти XX века, М., 1959; Цімашкова Л. Я. Беларуска-балгарскія літаратурныя сувязі, Мн., 1963; Цапенко М. П. Архитектура Болгарии. Очерк, М., 1953; Цырлин И. Изобразительное искусство Болгарии XIX—XX веков. Очерк, М., 1953; Мавродинов Н. Изкуството на българското Възраждане, София, 1957; Христов Д. Теоретические основы болгарской народной музыки, [пер. з балг.], М., 1959; Сборник статей болгарских музыковедов, М., 1962; Державин К. Болгарский театр, М.—Л., 1950; Погожева Л. Художественные фильмы Болгарии, М., 1963.

М. Т. Раманоўскі (прырода, гаспадарка), *Д. В. Мельцэр* (гістар. нарыс). Мінск; *І. М. Шаптуноў* (літаратура). Масква; *Н. С. Гілевіч* (літаратура), *Т. Ц. Мудрогіна* (тэатр). Мінск; *А. Х. Трансберг* (архітэктура, выяўл. мастацтва), *Л. Я. Сярпінская* (кіно). Масква.

БАЛГАРЫЯ ВОЛЖСКА-КАМСКАЯ, раннефеадальная дзяржава 10—15 ст. у Сярэднім Паволжы, Прыкам'і і Прыўраллі. Першапачаткова гэтыя землі насялялі фіна-угорскія плямёны. У 7 ст. з Прыазоўя прыйшлі цюркамоўныя балгарскія плямёны. Да 10 ст. волжскія балгары-качэўнікі плацілі даніну Хазарскаму каганату.



Самастойная гісторыя Б. В.-К. пачынаецца з перамогі кн. Святаслава над хазарамі ў 965. Да гэтага часу балгары канчаткова перайшлі на аселасць, усталяваліся феад. адносіны. Значнымі цэнтрамі рамяства і гандлю былі гарады *Балгар* (Булгар), Біляр, Сувар, Ашэль, Жукоцін. Праз В. В.-К. праляглі гандл. шляхі з Усх. Еўропы на У, што садзейнічала развіццю сувязей з інш. народамі. З 977 да пач. 12 ст. адбываліся частыя сутычкі балгар з рус. князямі за прыгранічныя землі, гэта прымусіла балгар перанесці сталіцу з Балгара ў Біляр. У 1236—41 мангола-татарскія ханы разбілі балгар, і Б. В.-К. ўвайшла ў склад

Залатой Арды. У 2-й пал. 14 ст., аслабленая і падзеленая на Балгарскае і Жукоцінскае княствы, Б. В.-К. не магла процістаяць рус. князям і войскам *Цімура*. У 30-я г. 15 ст. рус. феадалы завалодалі балг. землі на Пд ад Камы. На астатнім тэр. Б. В.-К. узнікла *Казанскае ханства*. Культура Б. В.-К. была важным кампанентам у фарміраванні залатаардынскай культуры, культур татар і чувашоў.

Літ.: Григорьев В. В. Волжские булгары, у кн.: Россия и Азия, СПб., 1876; Путешествие Ибн Фадлана на Волгу, М.—Л., 1939; Смирнов А. П. Волжские булгары, М., 1951 (Труды Государственного исторического музея, в. 19).

Л. Ц. Мірончыкаў. Мінск.

БАЛДУК, возера ў бас. р. Страча, правага прытока Віліі, у Пастаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,78 *км*², даўж. 2 *км*, сярэдняя шыр. 0,39 *км*. Найб. глыб. 40 *м*, сярэдняя 15 *м*. Вадазбор буйнаўзгорысты. Воз. мезатрофнага тыпу. Водзяцца акунь, плотка, шчупак і інш.

БАЛЕАРСКІЯ АСТРАВЫ (ісп. Islas Baleares), у зах. частцы Міжземнага м. Найбольшыя а-вы: Мальёрка, Менорка, Івіса і Фарментэра (апошнія два належаць да групы Пітыузскіх а-воў). Б. а. складаюць ісп. правінцыю Балеарскія астравы. Пл. 5 тыс. *км*². Паверхня пераважна нізінная, на в-ве Мальёрка горныя хрыбты (выш. да 1445 *м*). Клімат міжземнаморскі. Нас. 468,3 тыс. чал. (1964), пераважаюць каталонцы. Сады і агароды штучна арашаюцца. Вываз міндалю, фігі, алівы, цытрусавых. Турызм. Адм. ц. і гал. порт г. Пальма на в-ве Мальёрка. На Б. а. ваенная база ЗША.

БАЛЕ́Т (франц. ballet ад лац. ballo танцую), від сінтэтычнага сцэнічнага мастацтва, змест якога выяўляецца ў танцавальна-музычных вобразах. Звычайна тэрмін ужываецца толькі ў дачыненні да еўрап. класічнага Б., хоць спецыфічны Б. існуе і ва ўсх. краінах — Індыі, Кітаі, Інданезіі і інш.

Еўрап. Б. узнік у Італіі ў эпоху Адраджэння. У канцы 14 ст. пачаў складвацца тэатр. танец, які пазней атрымаў драматург. афармленне, стаўшы часткай цэласнага сінтэтычнага спектакля. Першыя сюжэтныя спектаклі з'явіліся ў Францыі ў 2-й пал. 16 ст. («Камедыйны балет каралевы», 1581, і інш.). У той час і ў 17 ст. Б. не быў яшчэ аддзелены ад паэтычнага тэксту (асн. жанры — камедыя-Б. і опера-Б.). Пазней адбываецца адасабленне Б. ад інш. жанраў і паступовая драматызацыя (напр., пастаноўкі Дж. Уівера і М. Сале ў Англіі). Як самастойны від мастацтва канчаткова сфарміраваўся ў 2-й пал. 18 ст. пад уплывам ідэй франц. асветніцтва. Ж. Ж. *Навер*, харэограф і тэарэтык Б., стварaў на сюжэты класіцысцкіх трагедый, антычнай гісторыі і міфаў спектаклі, якія вызначаліся цэласнасцю, лагічным развіццём сюжэта. Сродкам яго выяўлення была перш-наперш пантаміма. Паслядоўнікі Навера, у прыватнасці Ж. Дабервaль, развівалі ўжо дзейснасць самога танца. У 2-й пал. 18 ст. балетныя т-ры ўзніклі ў Аўстрыі, Даніі, Іспаніі, Бельгіі, Нідэрландах, Швецыі, Германіі. Прынцыпы дзейснага Б. развівaў і італьянскі балетмайстар С. Вігано.

У Расіі балетныя спектаклі ставіліся з сярэдзіны 30-х г. 18 ст. Іх тэматыка пераважна міфалагічная. Дзейсныя пантамімныя Б. класіцысцкага кірунку прапагандавалі Ф. Гільфердынг, Г. Анджаліні. Рус. нац. тэматыка і фальклор выкарыстоўваліся ў танц. інтэрмедыях камічных опер, дывертысментах. На мяжы 18 і 19 ст. з'явіліся Б., у ідэйных і стылявых адносінах блізкія да сентыменталізму («Новы Вертэр» балетмайстра І. *Вальберха*). У 20-я г. 19 ст. рус. Б. заняў адно з першых месцаў у еўрап. харэагр. мастацтве.


Дасягненні франц. і рус. Б. канца 18 — пач. 19 ст. абумовілі ўзнікненне рамантычнага Б., рысы якога выявіліся ўжо ў 20-я г. ў рус. пастаноўках Ш. *Дзідло*, у спектаклях А. *Глушкоўскага*. Дзідло, развіваючы вопыт Навера, Дабервaля, Вальберха, паступова пераходзіў ад вобразнай пантамімы да вобразнага танца. Найлепшымі выканаўцамі ў яго Б. былі М. Данілава і А. *Істоміна*. Склаўшыся канчаткова ў 30-я г. ў Францыі, рамант. Б. стаў вяршыняй харэагр. мастацтва 19 ст. Менавіта ў сферы рамантычнага танец узнікаў найбольш натуральна і заканамерна, адлюстроўваючы абагульненае, ідэалізаванае ўяўленне пра чалавека. У работах балетмайстра Ф. Тальёні, разлічаных на танцоўшчыцу М. *Тальёні*, выпрацаваўся новы стыль: развіццё тэхнікі скачкоў і ўвядзенне жаночага танца на пальцах дазваллі стварыць уражанне палёту, лунання ў паветры. Пастаноўкі Тальёні падрыхтавалі з'яўленне найбольш славутага рамант. Б. «Жызэль» (муз. А. Адана, харэаграфія Ж. Каралі і Ж. *Перо*, 1841). Харэограф Перо і танцоўшчыца Ф. *Эльслер* былі прадстаўнікамі іншай плыні ў рамант. Б.: блізкая да творчасці паэтаў-рамантыкаў дэмакр. кірунку (В. Гюго, Дж. Байран), яна ўздзейнічала сваёй эмацыянальнай сілай («Эсмеральда» Ц. Пуні, «Карсар» Адана). Рамант. Б. развіваўся таксама ў Даніі (балетмайстар А. Бурнанвіль), Расіі (танцоўшчыцы А. *Андрыянава*, К. Санкоўская). З аслабленнем рамантызму еўрап. Б. паступова страчваў змястоўнасць і пад канец 70-х г. стаў выцясняцца танц. рэвю і феерыяй. Гэты працэс адбіўся і на рус. т-ры («Канёк-Гарбунок» Пуні ў паст. А. Сен-Леона і інш.). У Расіі распад формы рамант. балетнага спектакля не прывёў да выраджэння Б., бо адначасова складвалася эстэтыка «вялікага Б.» — манумент. спектакля, дзе сюжэт развіваўся ў пантамімных сцэнах, але асн. тэму твора раскрывалі вялікія танц. сцэны са сваёй спецыфічнай вобразнасцю. Выдатным майстрам «вялікага Б.» быў М. *Петыпа*, у яго работах танец дасягнуў найвышэйшай тэхн. дасканаласці і выразнасці. З прыходам у балетны т-р кампазітараў-сімфаністаў П. Чайкоўскага і А. Глазунова танец знайшоў апору ў музыцы: танц. ансамблі «Спячай красуні», «Раймонды» (паст. Петыпа 1890 і 1892), «Шчаўкунка» і «Лебядзінага возера» (паст. Л. Іванова 1892 і 1895), як і сімф. музыка, паэтычна абагульняюць думкі і пачуцці. Пры ўсёй значнасці дасягненняў рус. харэагр. т-ра канца 19 ст. на мяжы 20 ст. стала зразумела, што каноны акадэм. Б. — перашкода новаму. Наспела патрэба рэформы, якую здзейсніў М. *Фокін*. У садружнасці з выдатнымі мастакамі А. Бенуа, Л. Бакстам і інш. ён стварыў новы тып спектакля, драматургічна завершанага, цэласнага, лаканічнага (яго Б. звычайна аднаактовыя). На месца кананічных кампазіцый (па дэдэ, гран па і інш.) прыйшла новая харэаграфія з дынамічнай танц. пантамімай і прасякнутым мімічнай выразнасцю танцам. З-за таго, што імператарская сцэна абмяжоўвала магчымасці навatарства, многія свае спектаклі («Палавецкія танцы» А. Барадзіна, «Жар-птушка» і «Пятрушка» І. Стравінскага) Фокін ставіў у час «Рускіх сезонаў» у Парыжы (1909—12 і 1914). Да лепшых яго работ належаць таксама «Шапэніяна», «Карнавал» на муз. Р. Шумана, «Лебедзь» на муз. К. Сен-Санса. Спробу рэфармаваць Б. у рамках імператарскіх т-раў зрабіў у пач. 20 ст. А. *Горскі* ў Маскве. Яму належаць арыгінальныя аднаактовыя і манумент. пастаноўкі («Дачка Гудулы» А. Сімана, «Саламбо» А. Аранда) і многія перапрацоўкі Б. класічнай спадчыны. Найб. відомыя артысты канца 19 — пач. 20 ст.: М. Кшасінская, В. Праабражэнская, Г. *Паўлава*, Т. Карсавіна, В. Ніжынскі ў Пецярбурзе, К. Гельцэр, В. Ціхаміраў, М. Мордкін у Маскве.

У 20 ст. пад уплывам гастроляў рус. артыстаў (Рускага балета С. Дзягілева, трупы Пaўлавай, пазней міжнар. калектываў, дзе было многа рускіх) павялічала цікавасць да Б. ў Еўропе і Амерыцы. На пач. 30-х г. Б. стаў адным з самых папулярных відаў мастацтва. У Францыі актывізавалася дзейнасць трупы Гранд-Опера (балетмайстар С. Ліфар), пасля 2-й сусв. вайны з'явілі


1


2


3


4


5


6


7

Балет I. 1. «Цырцэя» Б. Бальтазарыні. Тэатр Пці-Бурбон. Парыж. 1581. 2. «Трыумф кахання» Ж. Б. Люлі. Паст. П. Башана. Парыж. 1681. 3. Танцоўшчыца М. Камарго. Фрагмент карціны Н. Ланкрэ. 1730. 4. М. Тальёні ў балеце «Сільфіда» Ж. Шнейцгофера. Гравюра з карціны Г. Леполя. 5. «Шах і мат» А. Бліса. Паст. Н. дэ Валуа. Трупа «Вік-Уэлс бале». 1937. 6. «Кармэн» на муз. Ж. Бізэ. Паст. Р. Пці. Трупа «Бале дэ Пары». 1949. 7. «Прыгожая Алена» на муз. Ж. Офенбаха. Паст. Дж. Кранка. Парыж. 1955. 8. «Агон» І. Ф. Стравінскага. Паст. Дж. Баланчына. Трупа «Нью-Йорк сіці бале». 1957. 9. «Начны цень» на муз. В. Беліні. «Балет маркіза дэ Кюзвас». Лондан. 1948. 10. «Драўляны прынц» Б. Бартака. Паст. Дз. Харангаза. Будапешт. 1958.


8


9



10


1


2


3


4


5


6

Балет II. 1. «Наяда і рыбак». Паст. Ж. Перо. Спектакль у Пецяргофе. 1851. 2. «Канёк-Гарбунок» Ц. Пуні. Паст. А. А. Горскага. Вялікі т-р. Масква. 1901. 3. Г. П. Паўлава. «Лебедзь» на муз. К. Сен-Санса. Паст. М. М. Фокіна. 1907. 4. «Жар-Птушка» І. Ф. Стравінскага. Паст. М. М. Фокіна. Парыж. 1910. 5. «Чырвоны мак» Р. М. Глізра. Паст. Л. М. Лаўроўскага. Вялікі т-р СССР. 1949. 6. «Бахчысарайскі фантан» Б. У. Асаф'ева. Паст. Р. У. Захарава. Вялікі т-р СССР. 1948. 7. «Рамэо і Джульета» С. С. Пракоф'ева. Паст. Л. М. Лаўроўскага. Вялікі т-р СССР. 1946. 8. «Лебядзіное возера» П. І. Чайкоўскага. Паст. У. П. Бурмейстэра. Муз. т-р імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі. Масква. 1953. 9. «Легенда пра каханне» А. Д. Мелікава. Паст. Ю. М. Грыгаровіча. Т-р оперы і балета імя Кірава. Ленінград. 1961.


7


8


9

ліся трупы на чале з балетмайстрамі Р. Пці, Ж. Шара, М. Бежарам. У Англіі вядучы калектыў «Каралеўскі балет» (балетмайстры Н. дэ Валуа, Ф. Аштан, Дж. Кранка), у ЗША — «Нью-Йорк сіці бале» (Дж. *Баланчын*), «Амерыканскі балетны тэатр» (А. Цюдар, А. дэ Міль). У 30-я г. ажывілася работа дацкага, швед. Б., пасля 2-й сусв. вайны ням., аўстр., галандскага, італьянскага, Б. лаціна-амер. краін. Вялікія поспехі Б. і ў краінах сацыялізма.

Сав. Б. успрыняў і развіў як традыцыі «вялікага Б.» Петыпа, так і знаходкі Фокіна. Адначасова ў ім выявіліся новыя якасці і тэндэнцыі. 20-я г. азначыліся напружанымі пошукамі новага зместу і новых формаў. Ф. Лапухоў звяртаўся да танц. плаката (муз. У. Дзешавова), традыцый нар. т-ра («Байка пра Лісу» і «Пульчынела» Стравінскага), танц. сімфоніі («Веліч Сусвету» на муз. 4-й сімфоніі Л. Бетховена). К. *Галяйзоўскі* імкнуўся перадаць дух сучаснасці ў эмацыянальным плане, выкарыстоўваючы музыку А. Скрабіна, К. Дэбюсі, С. Пракоф'ева. Найб. значная яго пастаноўка — «Іосіф Прыгожы» С. Васіленкі. Прыкладам якасна новага выкарыстання прыёмаў, знойдзеных у спектаклях папярэдніх гадоў, служаць «Ледзяная дзяўчына» Лапухова на муз. Э. Грыга (1927) і пастаўлены ў тым самым годзе Л. Лашчыліным і Ціхаміравым сучасны па сюжэце Б. «Чырвоны мак» Р. Гліэра. Матроскі танец «Яблычак» з гэтага Б. падрыхтаваў узнікненне вял. гераічных масавых танцаў у многіх сав. Б. 30-х г. («Полымя Парыжа» Б. Асаф'ева, паст. В. Вайнанена 1932; «Сэрца гор» А. Баланчывадзе і «Лаўрэнсія» А. Крэйна, паст. В. *Чабукіяні* 1938 і 1939). Адначасова ўзнік і новы тып гераічнага акцёра (М. *Сямёнава*, А. *Ермалаеў*, Чабукіяні). У 30—40-я г. гал. жанрам стала балетная драма. Складваліся прынцыпы рэаліст. балетнай драматургіі — сцэнарнай, музычнай, харэаграфічнай. Балетмайстарскае мастацтва ўсё больш збліжалася з рэжысёрскім. Б. шырока выкарыстоўваў сюжэты з класічнай л-ры («Бахчысарайскі фантан» Асаф'ева, паст. Р. *Захарава* 1934; «Рамэо і Джульета» Пракоф'ева, паст. Л. *Лаўроўскага* 1940, і інш.). У спектаклях драм. плана асабліва поўна раскрыўся талент Г. *Уланавай*, К. *Сяргеева*, М. Габовіча. У гэтыя гады вылучыліся Т. Вечаслова, Н. *Дудзінская*, В. *Лепляшынская*. Хоць у жанры Б.-драмы ў 30—40-я г. было шмат творчых дасягненняў, тагачасны погляд на яго як на адзіна магчымы жанр у балетным мастацтве быў памылковы. Драматызацыя Б. часам прыводзіла да падмены танца пантамімай і страты балетнай спецыфікі. З сярэдзіны 50-х г. у сав. Б. зноў назіраецца разнастайнасць творчых пошукаў. Вылучыліся новыя таленавітыя балетмайстры. Л. Якабсон адрадзіў жанр Б.-плаката («Клоп» Ф. Атказава і Г. Фірціча, «Дванаццаць» Б. Цішчанкі), цікавыя спробы І. Бельскага ў галіне сімф. Б. («Ленінградская сімфонія» на муз. 7-й сімф. Дз. Шастаковіча, «Бераг надзеі» А. Пятрова), Ю. *Грыгаровіч* развіваў танц. драму, якая набыла новую якасць, стаўшы танц.-сімфанічнай («Каменная кветка» Пракоф'ева, «Легенда пра каханне» А. Мелікава, «Спартак» А. Хачатурана). Сярод вядомых артыстаў Б.: А. Асіпенка, Н. Бяссмертнава, І. Калпакова, К. Максімава, М. *Плісецкая*, Р. *Стручкова*, Н. Цімафеева, У. Васільеў, Ю. Салаўёў. Адна з самых важных асаблівасцей сав. Б.— развіццё яго нац. адгалінаванняў. Ужо ў канцы 30-х г. амаль усе саюзныя рэспублікі мелі свае балетныя трупы з нац. рэпертуарам, кадрамі балетмайстраў і артыстаў.

На Беларусі ўжо ў 18 ст. існавалі прыгонныя балетныя трупы (гл. *Гродзенскі тэатр Тызенгаўза, Радзівілавы тэатры, Слонімскі тэатр Агінскага, Шклоўскі тэатр Зорыча*). У 40-я г. 19 ст. ў Віцебску працавала прыватная трупа польскага балетмайстра М. Піёна (гл. *Віцебскі балет Піёна*), у складзе якой былі і бел. прыгонныя артысты. У 19 і асабліва ў пач. 20 ст. нар. танцы выконваліся ў драм. спектаклях, у канцэртных выступленнях Першай бел. трупы І. Буйніцкага. Але нац. балетны т-р узнік толькі пасля Кастр. рэвалюцыі. Першыя Б. паставіў К. *Алексютовіч* на сцэне БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы), дзе акрамя драм. трупы былі аркестр, хор і балетная трупа. У 1933 адкрыты Бел. т-р оперы і балета. Ставіліся класічныя і сав. Б., а ў 1939 з'явіўся першы нац. Б. «Салавей» М. Крошнера (балетмайстар А. Ермалаеў) пра барацьбу бел. сялян за свабоду. У харэагр. мове Б. «Салавей» класічны і нар. танец зліліся ў адно. У гэты перыяд сталі вядомыя артысты З. *Васільева*, А. *Нікалаева*, С. *Дрэчын*, К. *Мулер*. Пасля Айч. вайны ў стварэнні нац. рэпертуару ўдзельнічалі кампазітары В. Залатароў («Князь-возера», балетмайстар Мулер, 1949; на тую ж музыку балеты «Апавесць пра каханне», 1953, «Палымяныя сэрцы», 1955, балетмайстар Ермалаеў), Я. Глебаў («Мара», паст. А. *Андрэева* 1961; «Альпійская балада» і «Выбранніца», паст. А. *Дадышкіліяні* 1967 і 1969), Г. Вагнер («Падстаўная нявеста», паст. Мулера 1958; «Святло і цені», паст. Андрэева 1963). Сярод пастановак Бел. т-ра — усе балеты Чайкоўскага, «Кызэль» і «Карсар» Адана, «Золушка» і «Рамэо і Джульета» Пракоф'ева, «Сцежкаю грому» К. Караева, «Спартак» Хачатурана. У розны час у т-ры працавалі салісты Б.: В. *Давыдаў*, Н. *Давыдзенка*, І. *Дзідзічэнка*, Т. *Караваева*, А. *Карэлікова*, Б. *Карпілава*, Р. *Красоўская*, В. *Крыкава*, К. Малышава, Н. *Младзінская*, М. *Пятрова*, Л. *Ражанава*, І. *Савельева*, Я. *Глінскіх*, Г. *Мартынаў*, В. *Міронаў*, Л. *Чахоўскі*, М. *Шэхаў*. Большасць цяперашняй балетнай трупы — выпускнікі Бел. харэагр. вучылішча. Іл. на ўкл. да арт. *Балет* і *Беларускі тэатр оперы і балета*.

Літ.: Все о балете. Словарь-справочник, сост. Е. Сурц. М.—Л., 1966; Катонова С. Музыка в балете, Л., 1961; Красовская В. Русский балетный театр от возникновения до середины XIX века. Л.—М., 1958; *яе ж.* Русский балетный театр второй половины XIX века. Л.—М., 1963; Слонимский Ю. Советский балет; М.—Л., 1950; Чурко Ю. Белорусский балет. Мн., 1966; Rebling E. Ballett gestern und heute, Berlin, 1957.

Л. Я. Сурыц. Масква; *Ю. М. Чурко.* Мінск.

БАЛІВАР (Bolivar) Сімон (24.7.1783—17.12.1830), адзін з кіраўнікоў барацьбы за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы, ваенны і дзяржаўны дзеяч Паўд. Амерыкі. Н. ў Каракасе (Венесуэла) у сям'і багатага памешчыка-крэола. Вучыўся ў Еўропе. З 1810 актыўна ўдзельнічаў у барацьбе супраць іспан. панавання ў Венесуэле. У 1813 узначаліў 2-ю Венесуэльскую рэсп. Пасля ле паражэння (1814) пакінуў радзіму, у 1816 вярнуўся. Адмена рабства (1816) і дэкрэт 1817 пра надзяленне салдатаў вызваленчай арміі зямлёй забяспечылі Б. падтрымку шырокіх мас. У 1819 яго армія вызваліла Новую Гранаду (сучасная Калумбія). Б. стаў прэзідэнтам (1819—30) федэрацыі Вялікая Калумбія, у склад якой увайшлі Венесуэла, Новая Гранада і ў 1822 правінцыя Кіта (сучасны Эквадор). У 1824 армія Б. разбіла апошнія іспан. войскі ў Перу, і ён стаў там дыктатарам. У 1825 узначаліў рэспубліку ў Верхнім Перу, якую ў яго гонар назвалі Балівіяй. Дамагаўся аб'яднання незалежных рэспублік у канфедэрацыю, але беспаспяхова. Дзейнасць яго мела прагрэс. значэнне і аб'ектыўна садзейнічала бурж. развіццю лацінаамер. краін. Народы Лац. Амерыкі шануюць памяць Б.



Літ.: Маркс К. Боливар-и-Понте, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 14; Лаврецкий И. Р. Боливар, 2 изд., М., 1966.

БАЛІВІЯ, Рэспубліка Балівія (Republica de Bolivia), краіна ў цэнтральнай частцы Паўд. Амерыкі. Пл. 1098,6 тыс. км². Нас. 4446 тыс. чал. (1968). Паводле канстытуцыі сталіца Сукрэ, фактычна сталіца Ла-Пас. Б. падзяляецца на 9 дэпартаментаў. Канстытуцыя прынята 2.2.1967. На чале дзяржавы і ўрада стаіць прэзідэнт. Выбіраецца прамым галасаваннем на 4 гады. Заканадаўчая ўлада ажыццяўляецца Нац. кангрэсам, што складаецца з палаты дэпутатаў і сената. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад, які назначаецца і ўзначальваецца прэзідэнтам. Судовая сістэма: Вярх. суд Б., акруговыя і ўчастковыя суды.





Прырода. Б. займае ўсх. частку Цэнтр. Андаў на З і вялікія раўніны на У. Цэнтр. частка Андаў Б.— пласкагор'е Пуна (каля 4 тыс. *м* над узр. м.). Яго абмяжоўваюць Зах. Кардыльера (г. Сахама, 6780 *м*) на З, Кардыльера Рэаль і Цэнтр. Кардыльера на У. Клімат Пуны і Зах. Кардыльеры высакагорны, трапічнага пояса, паўпустынны на З (ападкаў менш за 150 *мм* за год) і менш засушлівы на У (500—600 *мм* за год). Т-ра студз. 9—11, чэрв. 3—7 °С. На ўсх. схілах Андаў вышынная пояснасць клімату, ападкаў 1500—2000 *мм* за год. На ўсх. раўнінах клімат субэкватарыяльнага пояса. Т-ра ад 17 да 28 °С, ападкаў каля 1000 *мм* за год. Рэкі на У належаць да бас. Амазонкі (Бені — Мамарэ). Рэкі нагор'я ўтвараюць бяссцёкавы басейн воз. Паапо з воз. Тытыкака на граніцы з Перу. Расліннасць Пуны пераважна паўпустынная. У гарах вертыкальная пояснасць. На раўнінах саваны (на Пн) і трапічныя лясы (на Пд). Жывёльны свет Пуны: ламы, грызуны, вадаплаўныя птушкі; на раўнінах у лясах шыраканосыя малпы, ляніўцы, мурашкаеды, учыстхвостыя дзікабраз і мядзведзь; шмат птушак і насякомых.

Насельніцтва. Большая частка — індзейцы: кечуа на Пд і У нагор'я, аймара на Пн. ⅓ насельніцтва — метысы і крэолы (патомкі заваёўнікаў-іспанцаў), пераважна ў гарадах. Дзярж. мова іспанская, рэлігія каталіцкая. Паўн. і ўсх. раёны населены рэдка. У гарадах ⅓ насельніцтва. Найбольшыя гарады Ла-Пас— 482 тыс. ж. (1967), Качабамба — 153 тыс. ж.

Гістарычны нарыс. У старажытнасці тэр. Б. насялялі індзейскія плямёны, якія знаходзіліся на розных стадыях першабытнаабшчыннага ладу. У 14 ст. іх заняволілі інкі. У 30-я г. 16 ст. тэр. сучаснай Б. заваявалі іспанцы і пад назвай Верхняе Перу далучылі у 1542 да віцэ-каралеўства Перу, а ў 1776 да віцэ-каралеўства Рыо-дэ-Ла-Плата. Дзякуючы здабычы ў Верхнім Перу серабра (з 1545) яго тэр., асабліва ў 16—17 ст.,— адзін з важных эканам. цэнтраў іспан. калоній у Амерыцы. Больш за палову ўсіх зямель разам з насельніцтвам стала здабыткам іспан. каланізатараў. Індзейцы адбывалі абавязковую працоўную павіннасць у сярэбраных рудніках, на буд-ве і рамонце дарог, на с.-г. работах і г. д. У 16—18 ст. індзейцы няраз паўставалі супраць іспан. эксплуатацыі. Самае вялікае паўстанне 1780—81 з'явілася

Вуліца ў Ла-Пасе.





часткай магутнага рэвалюц. руху індзейскіх плямёнаў Перу пад кіраўніцтвам Тупак-Амару II. У маі 1809 пачалася 15-гадовая вайна за незалежнасць краіны. Барацьба народаў Верхняга Перу супраць іспан. каланізатараў мела вялікае значэнне для развіцця выз. руху на тэр. ўсяго віцэ-каралеўства Ла-Плата. У 1824 прэзідэнт Вялікай Калумбіі С. *Балівар* быў абвешчаны «пратэктарам» Перу. Яго войскі да пач. 1825 вызвалілі Верхняе Перу. У жн. 1825 кангрэс у Чукісацы (сучасны Сукрэ) абвясціў незалежнасць Верхняга Перу, стварэнне рэспублікі, адмяніў рабства. Пажыццёвым прэзідэнтам рэспублікі выбраны Балівар. У яго гонар Верхняе Перу названа Балівіяй.

Развіццё капіталіст. адносін стрымлівалася эканам. раз'яднанасцю краіны, адсталай с. гасп., дзе асталіся феад.-прыгонніцкія метады эксплуатацыі, а ў асобных раёнах — натуральная гаспадарка. Паміж рознымі памешчыцкімі клікамі ішла бязлітасная барацьба за ўладу, адбываліся мяцяжы і перавароты (1826, 1831, 1843, 1851, 1861, 1868, 1871, 1878, 1880). У выніку Ціхаакіянскай вайны 1879—83 (В. і Перу супраць Чылі) Б. страціла частку пустыні Атакама, багатай на салетру, выхад да Ціхага ак. У 2-й пал. 19 ст. адкрыццё ў Б. багатых запасаў волава выклікала прыток замежнага, пераважна англ., капіталу. Напярэдадні 1-й сусв. вайны ўзмацніўся ўдзел амер. манаполій у распрацоўцы мінер. рэсурсаў Б. Горназдабываючая прамысл. набыла першачарговае значэнне.

У 1-ю сусв. вайну (да 1917) Б. трымалася нейтралітэту, але не эканоміка была падпарадкавана інтарэсам краін Антанты. Пад уплывам Кастр. рэв. пачаўся ўздым антыімперыялісц. руху. У выніку перавароту 1920 да ўлады прыйшла праамер. бурж.-памешчыцкая Рэсп. партыя (заснаў. ў 1914). Павялічылася пранікненне амер. манаполій у эканоміку Б. У гады сусв. эканам. крызісу 1929—33 гаспадарка Б. зусім заняпала. Цяжкія ўмовы жыцця ў горадзе і ў вёсцы з'явіліся прычынай забастовак рабочых, паўстанняў індзейцаў-сялян. У 1932—35 Б. вяла супраць Парагвая справакаваную англа-амер. імперыялістамі вайну за багатую нафтай вобл. Чака-Барэаль, у якой страціла ⅔ спрэчнай тэр. Ваен. дзеянні яшчэ больш спустошылі краіну. Становішча абвастрылася саперніцтвам англ., амер. і герм. імперыялістаў за прыярытэт у балівійскай эканоміцы (перавароты 1934, 1936 і 1937).

У 1943 Б. абвясціла вайну Германіі, Італіі і Японіі. У 1945 устанавіла дыпламат. адносіны з СССР. У 2-ю сусв. вайну і пасля амер. капітал усё больш завалодвае эканомікай Б., абвастраюцца класавыя супярэчнасці. У 1942 з дапамогай войск урад Пеньяранды задушыў забастоўку гарнякоў на рудніках Патыньё. У 1947—48 паўсталі сялянe-індзейцы, у 1949—50 забаставалі рабочыя-гарнякі. У 1950 засн. Камуніст. партыя Б. (КПБ), у 1952 — Балівійскі рабочы цэнтр, які патрабаваў нацыяналізаваць замежныя манаполіі, правесці аграрную рэформу. Нар. паўстанне (крас. 1952) скінула ўрад памешчыкаў і буйных шахтаўладальнікаў. Да ўлады прыйшла нац. буржуазія. Выразнікам яе інтарэсаў была партыя Нацыяналіст. рэв. рух. Шырокі ўздым рабочага і сялянскага руху прымусіў урад прэзідэнта Пас Эстэнсора (1952—56) выдаць (1952) дэкрэт пра нацыяналізацыю алавяных руднікоў трох кампаній, увесці ўсеагульнае выбарчае права, абвясціць (1953) часткавую аграрную рэформу (адмена паншчыны і прыгоннай працы, канфіскацыя частк зямель у буйных уласнікаў з выплатай ім кампенсацыі на працягу 25 гадоў, абвяшчэнне сялян-арандатараў уласнікамі зямельных участкаў, што былі ў іх асабістым карыстанні; сяляне павінны выплаціць дзяржаве кошт зямлі за 25 гадоў), правесці мераприемствы для развіцця нар. асветы, культуры і навукі. Гэтыя меры выклікалі нездаволенасць імперыялістаў і супраціўленне ўнутр. рэакцыі. Амер. манаполіі пайшлі на эканам. націск, скарацілі вываз з Б. волава і свінцу. У такіх умовах урад, асабліва прэзідэнта Э. Сілес Суаса (1956—60), дзейнічаў нерашуча. Былі заключаны пагадненні з манаполіямі ЗША, пад націскам унутр. і знешняй рэакцыі прыпынена ажыццяўленне аграрнай рэформы. Не змяніў становішча і наступны ўрад прэзідэнта Пас Эстэнсора (1960—64). У ліст. 1964 камандаванне арміі на чале з генераламі Р. Бар'ентасам і А. Аванда Кандыя зрабіла дзярж. пераварот, скінула ўрад Пас Эстэнсора. У 1965 у краіне двойчы ўводзілася надзвычайнае становішча, супраць забастоўшчыкаў была кінута армія, уведзены «закон пра дзяржаўную бяспеку». 3.7.1966 прэзідэнтам выбраны Р. Бар'ентас. Яго ўрад заключыў з ЗША пагадненні, якія адкрылі шлях амер. манаполіям да больш шырокага завалодання эканомікай Б. У крас. 1967 па-за законам абвешчаны КПБ і інш. прагрэс. арг-цыі. У некат. раёнах пачалі дзейнічаць партыз. атрады. Але пасля гібелі Эрнеста Чэ *Гевары* (восень 1967) партыз. рух практычна спыніўся. У чэрв. 1967 уведзена асаднае становішча, адменены канстытуцыйныя гарантыі. У краіне не спыняўся забастовачны рух, студэнцкія хваляванні, абвастрыліся супярэчнасці ва ўрадзе, парламенце і паліт. партыях. У перыяд улады Бар'ентаса (загінуў у авіякатастрофе 27.4.1969, прыслугу на пасаду прэзідэнта прыняў віцэ-прэзідэнт Л. Сілес Салінас) Б. падтрымала інтэрвенцыю ЗША ў Дамініканскай Рэспубліцы, агрэсію ЗША ў В'етнаме. Ва ўмовах вострага ўнутрыпаліт. становішча 26.9.1969 адбыўся ваен. пераварот. Прэзідэнтам стаў ген. Альфрэда Аванда Кандыя. Новы ўрад адмяніў «закон пра нафту», наводле якога амер. манаполіі рабавалі багацце краіны, рэакц. «закон пра нац. бяспеку», аднавіў аўтаномію прафсаюзаў і канстытуцыйныя гарантыі. Падпісаны дэкрэт аб нацыяналізацыі амер. нафтавай кампаніі «Балівіян галф ойл». Урад заявіў пра сваё імкненне ўстанавіць дыпламат. адносіны з усімі краінамі, у т. л. сацыялістычнымі.

Гаспадарка. Б.— адна з самых эканамічна адсталых краін Лац. Амерыкі. Аснова гаспадаркі — горнарудная прамысл. экспартнага

кірунку. Эканоміка краіны залежыць ад замежнага, пераважна амер. і англ., капіталу. Б. займае 2-е (пасля Малайзіі) месца ў капіталіст. свеце па здабычы волава (раён гарадоў Арура, Патасі; 269 тыс. *т* канцэнтрату, 1967) і яго экспарце. Здабываюцца (утрыманне металу, тыс. *т*, 1967) сурмяныя (Патасі, Тупіса; 11,5), вальфрамавыя (Арура, Патасі; 2,0), медныя (6,3), свінцовыя (20,3), цынкавыя (16,7), вісмутавыя руды; золата, серабро, сера. Здабыча нафты (1,8 млн. *т*, 1967) на ПдУ, перапрацоўваецца пераважна ў Качабамба і Сукрэ. Саматужныя і рамесніцкія прадпр. харчовай (Ла-Пас, Санта-Крус, Арура, Патасі, Качабамба, Тарыха, Трынідад), тэкстыльнай (2 млн. *м* шарсцяных і 11 млн. *м* баваўняных тканін у 1966; Ла-Пас, Качабамба) і гарбарнай (Ла-Пас, Санта-Крус, Трынідад) прамысловасці. Невялікія з-ды для выплаўкі волава, свінцу, медзі (Арура, Качабамба). Электраэнергетыка развіта слаба. Выпрацоўка эл. энергіі 595 млн. *квт·гадз* (1967). С. гасп. не забяспечвае патрэб насельніцтва. У ёй занята $^2/_3$ самадзейнага насельніцтва, але апрацоўваецца толькі 2,8% зямлі, 10,3% пад пашай. Большасць сялян беззямельныя. Характэрна буйное паўфеад. землеўладанне з надзеламі больш за 5 тыс. *га* (21% зямлі, якая апрацоўваецца). Сеюць кукурузу (210 тыс. *га*, збор 271 тыс. *т*, 1966), пшаніцу (90 тыс. *га*, 70 тыс. *т*), рыс, цукр. трыснёг, авёс, бульбу. Жывёлу гадуюць пераважна на У і ў засушлівых раёнах нагор'я. У 1965/66 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 2,7, авечак 6,2, ламаў і альпака 0,5, коз 1,2. У лясах збор каўчуку, кары хіннага дрэва, лісця кокі. Даўж. чыгунак 3,6 тыс. *км* (1967), грунтавых аўтамаб. дарог 24 тыс. *км*. Суднаходства па рэках на У краіны і воз. Тытыкака. Знешні гандаль пераважна праз порты Перу (Мальенда) і Чылі (Арыка, Антафагаста). Б. вывозіць волава (канцэнтраты і метал, 70% кошту экспарту), сурму, свінец, серабро і інш. каляровыя металы, лісце кокі, каву, какаву; увозіць харч. прадукты, вадкае паліва, абсталяванне, тавары шырокага ўжытку. Гал. гандлёвыя партнёры — Вялікабрытанія і ЗША. Грашовая адзінка балівійскае песа.

Асвета. Школы (місіянерскія) існавалі ў Б. з 1-й пал. 16 ст. Пасля абвяшчэння рэспублікі пачалі адкрывацца дзярж. школы. У 1955 абвешчана ўсеагульнае і бясплатнае навучанне дзяцей ад 7 да 14 гадоў, але школу наведвае толькі каля паловы дзяцей школьнага ўзросту (44,5% у 1965). Дзіцячыя сады і школы дзяржаўныя і прыватныя. Гарадская пач. школа 6-гадовая, сельская — 4-гадовая. У 1964 у 6864 пач. школах вучылася 495 083 дзіцяці. Сярэдняя школа (каледжы для хлопчыкаў, ліцэі для дзяўчынак) 6-гадовая, мае 2 цыклы: 2- і 4-гадовы. У 1964 у 175 сярэдніх школах займалася 71 404 чал. Прафесіян. школы (4- і 6-гадовыя) на базе пач. школы. Настаўнікаў пач. школ рыхтуюць 4-гадовыя пед. школы, сярэдніх школ — вышэйшая пед. школа ў Сукрэ і вышэйшы пед. ін-т у Ла-Пасе. У Б. 7 ун-таў: Хуана Місаэль Серача (засн. ў 1936), Габрыэля Рэнэ Марэна (засн. ў 1880), тэхнічны ун-т (засн. ў 1892), Каралеўска-епіскапскі ун-т Сан-Францыска Ксаўера (засн. ў 1624) і інш. У 1965 у ВНУ Б. займалася 13 426 студэнтаў. Вялікія б-кі: Нац. канграсу, мін-ва замежных спраў, муніцыпальная б-ка «Андрэс дэ Санта Крус», б-ка нац. архіва. Нац. музей «Тыяуанака» ў Ла-Пасе, музей манетнага двара ў Патасі, археал. музей «Мануэль Гелар» у Сукрэ. Працуюць Балівійская АН, акадэмія аймарскай мовы, цэнтр выяўленчых мастацтваў, Археал. т-ва Б., Геагр. т-ва, 32 НДІ. Выходзяць газеты: «El Diario» («Газета»); «Presencia» («Прысутнасць») і інш.

Літаратура. Асн. помнік часоў імперыі інкаў — балівійска-парагвайская драма «Альянтай». У калан. перыяд л-ра Б. арыентавалася на л-ру метраполіі. З уздымам нац.-вызв. барацьбы (канец 18 ст.) з'явілася патрыят. публіцыстыка (В. Пасас Канка) і лірыка (Х. І. дэ Санхінес, паэт-індзеец Уальпарымачы). У 19 ст. пануе рамантызм (паэты Р. Х. Бустамантэ, Н. Галінда, Б. Ленс, раманіст і драматург Н. Агірэ, раманісты М. М. Кавальера, С. Вака Гусман). У канцы 19 ст. ўзнікае «кастумбрызм» (нараваапісальная л-ра): аповесці і апавяданні Л. Ансаатэгі дэ Кампера, А. Самудыо; у паэзіі ўмацоўваецца т. зв. мадэрнізм (Р. Хаймес Фрэйрэ, Г. Рэйнольдс, Х. Э. Гера). У пач. 20 ст. паяўляецца рэаліст. сац. раман (А. Аргедас, Х. Мендоса, А. Чырвечэс). У 20-п г. развіваецца сац. паэзія (А. Эстрэлья, Э. Паса, Ф. Дыес дэ Медына), драматургія (Н. Артыс Пачэка) і проза (Трыстан Мараф, Г. А. Атэра, Х. Агірэ). У 30-я г. стала папулярнай л-ра «індыхенізму», якая адлюстроўвала бяспраўнае жыццё індзейцаў (Р. Батальё Гансальвес, А. Гільен Пінта, Н. Парда Вальє). Раманы «Вогненны паток» А. Серута і «Сонца праваслуддзя» М. Мендосы Лопеса рэалістычна паказваюць рэвалюц. рух прыгнечаных. Найб. вядомы пісьменнік Х. Лара, які ў вершах і раманах («Сурумі», «Янакуна», «Наша кроў») выступае за сац. справядлівасць. Пасля паездкі ў СССР Лара праўдзіва паказаў у нарысах сацыяліст. буд-ва.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Б. ў 5—8 ст. стала адным з цэнтраў культ. развіцця старажытнай Амерыкі. У Тыяуанака (бераг воз. Тытыкака) пабудаваны грандыёзны храмавы комплекс [агульная плошча (*м*) 1000×450]. Зберагліся: узгорак-піраміда Акапана; комплекс Каласасая [(*м*) 135×130] з храмам і маналіт. «Варотамі Сонца» і інш., а таксама высечаныя з каменю масіўныя статуі (франтальныя, з ледзь азначанымі аб'ёмамі), паліхромная кераміка, фігурны посуд. Спадчына культуры Тыяуанака зберагласяў творчасці індзейцаў. Гэта вызначыла своеасаблівасць мастацтва і архітэктуры Б. калан. перыяду. Перасэнсаванне еўрап. узораў у духу мясцовых традыцый прывяло да стварэння цікавай барочнай архітэктуры 18 ст.: Манетны двор (1759—73) і ц. Сан-Ларэнса [каля 1548, аўтар фасада (1728—44) індзеец Кандоры] у Патасі, палацы Вільяверда (18 ст.) і Дыес дэ Медына (1775), ц. Сан-Франсіска ў Ла-Пасе (1743—84) і інш. 17—18 ст.— час росквіту дэкар. скульптуры. У 1-й чвэрці 18 ст. працаваў вял. майстар рэліг. жывапісу М. Перэс дэ



В. С. Рамера. Завалванне. Калонія. Незалежнасць. Роспіс ва універсітэце ў Сукрэ. 20 ст.



М. Нуньес дэль Прада. Танец чола. Чырвонае дрэва. Сярэдзіна 20 ст.

Альгуін. У мастацтве 19 ст. адчуваецца моцны франц. ўплыў. У 20-я г. 19 ст. ўзнікла нац. маст. школа. Жывапісец, скульптар і графік С. Гусман дэ Рохас першы звярнуўся да традыцыі стараж. мастацтва («Мацярынства»). Яго вучні і паслядоўнікі (Р. Бердэсіо, В. С. Рамера, М. Эхіда) стварылі манумент. роспісы. Творы скульптараў М. Нуньес дэль Прада, У. Альмараса поўныя драматызму і сімволікі. Побач з рэаліст. кірункам у 20 ст. пашырыўся абстракцыянізм, а з канца 50-х г.— «поп-арт». З 2-й пал. 20 ст. развіваецца сучасная архітэктура.

Літ.: Фадеев Ю. А. Боливия: революция и контрреволюция, М., 1966; Гонсалес Рауль Рус. Боливия — Прометей Анд, пер. с исп., М., 1963; Ширяев Б. А. Октябрьская революция и страны Латинской Америки, Л., 1968.

Н. Р. Дуброўская (прырода), *К. А. Альбіцкая* (гаспадарка). Масква; *А. Я. Пейсаховіч, Я. Н. Марголін* (гістарычны нарыс). Мінск; *Я. І. Кірычэнка* (архітэктура, выяўленчае мастацтва). Масква.

БАЛІГАЛОЎ (Conium), род двухгадовых травяністых раслін сямейства парасонавых. Сцябло голае, знізу з чырвонымі крапінкамі, выш. 60—180 *см*. Лісце чаргаванае, тройчы-перыстарассечанае. Кветкі дробныя, белыя. Суквецце — шчытападобны парасон. Вядома 4 віды, пашыраныя ў краінах Еўропы, М. Азіі і Паўн. Амерыкі. У СССР і ў БССР адзін від — Б. плямісты (C. maculatum, нар. назвы: пятрушнік, вобмег атрутны, свістульнік). Расце па ўзлесках і заліўных лугах, каля будынкаў, абапал дарог і як пустазелле ў пасевах. Уся расліна атрутная (асабліва плады), мае алкалоід каніін. Сок і спіртавы настой з лісця Б. ўжываюць у нар. медыцыне. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Ядавітыя расліны*.

В. А. Міхайлоўская. Мінск.

БАЛІНСКІ Міхал (14.8.1794, маёнтак Цярэспаль Полацкага пав.— 22.12.1863), гісторык, дзеяч асветы. Скончыў фіз.-матэм. ф-т Віленскага ун-та (1818). З 1816 рэд. «Tygodnika Wileńskiego» («Віленская штотыднёвіка»); чл. т-ва шубраўцаў, адзін з рэдактараў яго газ. «Wiadomości brukowe» («Вулічныя паведамленні»). У 1818—22 сакратар Віленскага друкарскага т-ва. У 1836—47 у камісіі нар. асветы ў Варшаве. Адзін з заснавальнікаў навук.-літ. час. «Biblioteka Warszawska» («Варшаўская бібліятэка», 1841). З 1847 віцэ-прэзідэнт Віленскай археал. камісіі, чл. Рус. геаграфічнага т-ва. У творах Б. багаты фактычны матэрыял з гісторыі Беларусі і Літвы эпохі феадалізму.

Тв.: Historia miasta Wilna, t. 1—2, Wilno, 1836—37; (разам з Ц. Лініскім) Starożytna Polska..., t. 1—3, Warszawa, 1843—50; Dawna akademia Wileńska..., Petersburg, 1862; Pamiętniki o Janie Śniadeckim..., t. 1—2, Wilno, 1864—65.


БАЛІНТЫНЯНУ (Bolintineanu) Дзімітрые (каля 1819, Балінтыну-дын-Вале каля Бухарэста — 20.8.1872), румынскі паэт і публіцыст. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Парыжы (1845—48). За ўдзел у рэвалюцыі 1848 быў арыштаваны. Эмігрыраваў у Францыю. У 1857 вярнуўся на радзіму. Займаў высокія дзярж. пасады. Рамантычная творчасць Б., якую натхнялі патрыят. і грамадз. ідэі, цесна звязана з вызв. рухам сярэдзіны 19 ст. Асн. зб. «Румынскія мелодыі» (1858), «Легенды, ці Арыгінальныя казкі ў вершах» (1858; 2 дап. выд. 1862), «Вершы» (т. 1—2, 1865), «Эўмеіды, ці Палітычныя сатыры» (1866). Адзін з пачынальнікаў рум. рамана («Манаіл», 1855; «Алена», 1862).

БАЛІСТЫКА (ням. Ballistik, ад грэч. bállō кідаю), навука пра рух артылерыйскіх снарадаў, ракет, мін, бомбаў, куль. Падзяляецца на знешнюю і ўнутраную. Знешняя Б. вывучае законы паступальнага і вярчальнага руху артыл. снарадаў у паветры пад дзеяннем сіл цяжару, аэрадынамічных і рэактыўных сіл і момантаў. У 50—60-я г. 20 ст. атрымала далейшае развіццё пры вывучэнні палётаў *балістычных ракет* і *касмічных лятальных апаратаў*. Унутраная Б. вывучае рух снарадаў у канале ствала пад дзеяннем парахавых газаў; законы гарэння пораху ў пастаянным і пераменным аб'ёме; работу рэактыўных рухавікоў.

Б. як навука пачала развівацца пад уплывам прац італьян. вучонага Н. Тартальі (16 ст.); Г. Галілея і І. Ньютана (17 ст.); Л. Эйлера (18 ст., даў рашэнне асн. задачы знешняй Б.). Вялікі ўплыў на развіццё Б. зрабілі працы рус. вучоных В. А. Анкудовіча, М. В. Астраградскага, М. У. Маеўскага (у 1870 напісаў курс знешняй Б., сусветна вядомы артылерыстам), сав. вучоных А. М. Крылова, Д. А. Вентцэля і інш.; з замежных вучоных вядомыя Дэ Спар, П. Шарбанье (Францыя), Ф. Мультан (ЗША).

Літ.: Серебряков М. Е. Внутренняя баллистика ствольных систем и пороховых ракет, 3 изд., М., 1962; Эйлер Л. Исследования по баллистике, пер. с нем., франц. и лат., М., 1961. *М. В. Яшнікаў.* Мінск.

БАЛІСТЫЧНАЯ РАКЕТА, бяскрылая ракета, траекторыя лёту якой складаецца з актыўнага і пасіўнага адрэзкаў шляху (балі-



Балістычная ракета:
1 — насавы адсек; *2* — прылады кіравання; *3* — акісляльнік; *4* — гаручае; *5* — паліўная помпа; *6* — помпа для акісляльніка; *7* — турбіна; *8* — камера згарання; *9* — сапло; *10* — газавы руль; *11* — паветраны руль; *12* — стабілізатар.

стычнай крывой). На актыўным участку ракета ляціць з дапамогай рухавіка і накіроўваецца аўтаномнай, наземнай ці камбінаванай сістэмай кіравання. На пасіўным рухавік выключаны, і лёт Б. р. ідзе па інерцыі, як свабодна кінутага цела. Б. р. бываюць адна- і шматступеньчатыя, развіваюць скорасць да некалькіх тысяч кіламетраў за гадзіну. Адрозніваюць Б. р. сярэдняй далёкасці і міжкантынентальныя. Да Б. р. адносяцца ракеты-носьбіты і касмічныя ракеты.

БАЛІЧЫ, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны сцяг». За 12 км на Пд ад Шчучына, 80 км ад Гродна, 8 км ад чыг. ст. Ражанка. 500 ж., двароў 128 (1970). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БАЛІЯК (Bolliac) Чэзар (26.10.1813, Бухарэст — 26.3.1881), румынскі паэт, публіцыст і палітычны дзеяч. Удзельнік нац.-вызв. руху 40-х г. і рэвалюцыі 1848 у Валахіі і Трансільваніі. Заснавальнік і рэдактар шэрагу прагрэс. газет. Паэзія Б. вызначаецца грамадз. пафасам і дэмакр. накіраванасцю. Эстэт. погляды выказаў у прадмове да зб. «Новыя вершы» (1847). Аўтар першай рум. драмы «Мацільда», літ.-крытычных артыкулаў, прац па археалогіі.

БАЛКАНСКІ ПАЎВОСТРАЎ, на Пд Еўропы. Паўн. мяжу ўмоўна праводзяць уздоўж Дуная і Савы. Працягласць з З на У 1260 км, з Пн на Пд 950 км. Пл. 505 тыс. км².

Берагі моцна парэзаныя; паблізу шмат а-воў, асабліва на Пд і ПдУ. Паверхня пераважна гарыстая. У цэнтр. ч.— Радопы, Рыла (г. Мусала, 2925 м, найвыш. вяршыня Б. п.), горы Македоніі і Зах. Сербіі. На ПнУ Стара-Планіна (Балканскія горы), на ПнЗ масіў Праклетые, на З горы Пінд. Нізіны і раўніны займаюць невял. плошчу на Пн і У. Частыя землетрасенні. Карысныя выкапні: вугаль, каляровыя металы, жал. руда, нафта, ртуць, баксіты і інш. Клімат на ўзбярэжжах міжземнаморскі, ва ўнутр. частцы і асабліва на Пн умерана кантынентальны; у гарах вышынная клімат. пояснасць. Найбольшыя рэкі: Дунай з прытокамі Сава і Марава — бас. Чорнага м.; Марыца, Вардар, Струма (Стрымон) — бас. Эгейскага м. Рэкі пераважна парожыстыя, маюць вял. запасы гідраэнергіі. Самыя вялікія азёры: Скадарскае, Ахрыдскае, Прэспа. Шмат мінер. і тэрмальных крыніц. Расліннасць міжземнаморскага тыпу на Пд, у ніжнім поясе гор. Вышэй за 400—500 м і ў больш паўн. раёнах лясы з вечназялёных і шыракалістых парод. На Пн і ў гарах унутр. часткі п-ва лясы з сярэднееўрап. відаў. Стэпавыя і лесастэпавыя раўніны паўн. і ўсх. часткі выкарыстоўваюцца пад ворыва. На Пд, у міжземнаморскім поясе, вырошчваюцца масліны, вінаград, цытрусавыя, са збожжавых пераважае пшаніца.

На Б. п. размешчаны Балгарыя, Албанія, Грэцыя, большая частка Югаславіі, часткова Румынія і Турцыя.



БАЛКАНСКІ САЮЗ 1912, ваенна-палітычны саюз Балгарыі, Грэцыі, Сербіі і Чарнагорыі, накіраваны супраць Турцыі і фактычна Аўстра-Венгрыі.

Афармлены праз заключэнне Балгарыяй некалькіх дагавораў: з Сербіяй (13.3.1912), Грэцыяй (29.5.1912) і Чарнагорыяй (вер. 1912). Дагаворы з Сербіяй і Грэцыяй былі падмацаваны ваен. канвенцыямі. Б. с. ствараўся пры актыўнай падтрымцы Расіі, якая разглядала яго як перашкоду экспансіі Германіі і Аўстра-Венгрыі на Балканы. У кастр. 1912 дзяржавы Б. с. пачалі вайну з Турцыяй і перамаглі. Неўзабаве паміж Балгарыяй, Сербіяй і Грэцыяй узніклі спрэчкі з-за падзелу захопленых тэр. Яны сталі прычынай 2-й Балканскай вайны (гл. *Балканскія войны*) і распаду Б. с.

БАЛКАНСКІЯ ВОЙНЫ 1912—13. Першая Б. в., у ходзе якой удзельнікі *Балканскага саюза 1912* намерваліся вызваліць ад тур. панавання народы Балканскага п-ва і стварыць нац. дзяржавы, пачалася 9.10.1912, калі Чарнагорыя выступіла супраць Турцыі.

18 кастр. да Чарнагорыі далучыліся Балгарыя, Грэцыя і Сербія. Войскі краін-саюзніц вызвалілі Македонію, Фракію, Албанію і інш. землі. Поспех армій балканскіх дзяржаў прымусіў тур. ўрад прасіць пасрэдніцтва ў вялікіх дзяржаў. Па іх ініцыятыве была склікана Лонданская канферэнцыя паслоў, якая распрацавала ўмовы міру. Новы тур. ўрад (прыйшоў да ўлады пасля перавароту младатуркаў 23.1.1913) не пагадзіўся з выпрацаванымі ў Лондане ўмовамі. 3.2.1913 ваен. дзеянні аднавіліся. Пасля паражэння тур. войск быў падпісаны Лонданскі мірны дагавор 1913. Паводле яго Турцыя страціла ўсе тэрыторыі на еўрап. кантыненце, акрамя Стамбула і невялікай часткі Усх. Фракіі.

Пасля перамогі паміж саюзнымі дзяржавамі ўзніклі спрэчкі з-за перадзелу захопленых тэрыторый, што з'явілася прычынай 2-й Балканскай вайны. Сербія і Грэцыя падпісалі сакрэтны саюз супраць Балгарыі. Да яго далучылася Румынія. Рознагалоссі паміж саюзнікамі ўскладняліся з-за інтрыг імперыялістаў дзяржаў. Аўстра-герм. дыпламатыя імкнулася раскалоць Балканскі саюз, які рускі ўрад разглядаў як сродак недапушчэння аўстра-герм. экспансіі на Балканы. У ноч на 30.6.1913 Балгарыя пачала наступленне супраць сербскіх і грэч. пазіцый у Македоніі. Але яно скончылася паражэннем. Гэта выкарыстала Румынія і 10 ліп. кінула свае ваен. сілы на Сафію. 23 ліп. супраць Балгарыі выступіла Турцыя. 29.7.1913 Балгарыя капітулявала.

Паводле Бухарэсцкага мірнага дагавору 1913 Балгарыя страціла большую частку зямель у Македоніі і Фракіі, Паўд. Дабруджу, а паводле Канстанцінопальскага мірнага дагавору 1913 — Адрыянопаль. Падзеі 2-й Б. в. вымусілі Балгарыю далучыцца да аўстра-герм. блоку, Румынію адысці ад Траістага саюза. Б. в. выклікалі абвастрэнне міжнар. супярэчнасцей, паблізілі 1-ю сусв. вайну.


Літ.: Ленін У. І. Падзеі на Балканах і ў Персіі, Тв., т. 15 (Полн. собр. соч., т. 17); яго ж. Балканскія народы і еўрапейская дыпламатыя, там жа, т. 18 (Полн. собр. соч., т. 22); яго ж. Балканская вайна і буржуазны шавінізм, там жа, т. 19 (Полн. собр. соч., т. 23); Жогов П. В. Дипломатия Германии и Австро-Венгрии и первая балканская война 1912—1913 гг., М., 1969; Трухнов Г. М. Провокационная политика Германии на Лондонской конференции послов по Балканскому вопросу, «Ученые записки БГУ. Сер. историческая», 1953, в. 16. *Р. М. Трухноў.* Мінск.

БАЛКАНСКІЯ ГОРЫ (Балканы), гл. *Стара-Планіна.*

БАЛОПСА, возера ў бас. р. Друйкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,47 км². Даўж. 1,9 км, сярэдняя шыр. 0,7 км, найб. глыб. 14,6 м, сярэдняя — 6,1 м. Уздоўж берагоў цягнецца пешырокая палоса воднай расліннасці: трыснёг, рдзесты, эладэя. У сярэдняй і паўд. частках воз. 2 невялікія астравы. Вадазбор (4,5 км²) буйнаўзгорысты, месцамі забалочаны; пераважаюць марэнны супесак і пясок. Воз. эўтрофнага тыпу. Злучаецца пратокай шыр. 200 м з воз. Струста. Водзяцца лешч, шчупак, акунь, плотка, карась, вугор.

БАЛОМЕТР (грэч. bolē прамень+metron мера), прылада, якою вымяраюць энергію выпрамянення. Дзеянне Б. заснавана на змене эл. супраціўлення тэрмаадчувальнага элемента пры награванні яго выпрамяненнем.

Змена супраціўлення вызначаецца на схеме моста ці з дапамогай кампенсацыйнай схемы, у якой два адчувальныя слаі Б. ўключаны паслядоўна (рыс. *б*). Калі на адзін са слаёў накіраваць перарывістае выпрамяненне, супраціўленне слоя мяняецца з частатой, роўнай частаце перарывання выпрамянення, і баланс кампенсац. схемы перыядычна парушаецца. Слабы сігнал пераменнага току падаецца на сетку ўзмацняльнай лямпы, потым на вымяральнае прыстасаванне. Б., у якім тэрмістарны адчувальны слой зроблены з вокіслаў кобальту і марганцу, вымярае патокі выпрамянення магутнасцю да 10^{-9} *вт* (рыс. *а*).



а) Канструкцыя балометра: *1* — акно, празрыстае для выпрамянення; *2* — адчувальны слой; *3* — шкляная падложкі; *4* — кампенсацыйны слой. *б*) Кампенсацыйная схема.

Есць Б., у якіх выкарыстана з'ява *звышправоднасці*, калі ахалоджаны слой моцна мяняе сваё супраціўленне пры малой змене тэмпературы, напр. Б. з нітрыду ніобію, які ахалоджваецца вадкім вадародам.

Б. карыстаюцца пры вымярэнні выпрамянення нябесных целаў, у спектраметрыі і тэхніцы інфрачырвоных прамяняў.

Літ.: Боич-Бруевич А. М. Радиоэлектроника в экспериментальной физике, М., 1966; Вафиади В. Г. Фотоэлектрическая автоматика, Мн., 1966; Марков М. Н. Приемники инфракрасного излучения. М., 1968. *У. Г. Вафіядзі.* Мінск.

БАЛОНАЎКА, рака, левы прыток р. Друці (бас. Дняпра). Даўж. 24 км. Пачынаецца на паўд.-ўсх. схілах Цэнтральнабярэзінскай раўніны, цячэ ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Рэльеф вадазбору (113 км²) плоскі, у паўн. частцы ўзгорысты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,6 м³/сек. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

БАЛОНСКАЯ ШКОЛА, адна з галоўных жывапісных школ Італіі. Узнікла і дасягнула росквіту ў 14 ст. У 2-й пал. 16 ст. стала адной з вядучых у Італіі. Мастакі браты Карачы ў 1580 заснавалі ў Балоньі «Акадэмію тых, хто стаў на правільны шлях», якая паклала пачатак развіццю *акадэмізму* ў еўрап. мастацтве. Ідэалізацыя прыроды, адцягненасць і ўзвышанасць вобразаў, знешняя эфектнасць ракурсаў у творчасці Анібале Карачы, Франчэска Альбані, Даменікіна, Гвіда Рэні, Гверч-

чына спалучаюцца з непасрэднасцю жыццёвых назіранняў (партрэт, жанравыя сцэны). Станоўчая роля Балонскай акадэміі ў развіцці сістэматычнай маст. адукацыі, якая грунтавалася перш за ўсё на вопыце вялікіх майстроў італьян. Адраджэння.

БАЛОТАЗНАЎСТВА, навука пра *балоты* і іх спецыфічныя ландшафты, пра іх развіццё і гаспадарчае выкарыстанне, галіна геаграфіі. Абагульняе звесткі па геабатаніцы, глебазнаўстве, гідралогіі, ландшафтазнаўстве. Мае батаніка-геаграфічны (фітацэналагічны) і тарфазнаўчы кірункі.

Б. ўзнікла ў канцы 17 — пач. 18 ст. ў Зах. Еўропе. Інтэнсіўна развівалася ў канцы 19 ст. ў сувязі з ростам меліярац. работ. У 1877 створана першая н.-д. ўстанова па культуры балотаў — Брэменская балотная доследная станцыя. Заснавальнік рускага Б. — М. В. Ламаносаў («Лифляндская экономия», 1738). У 1772 акад. П. С. Палас арганізаваў вывучэнне балотаў на Урале і ва Уладзімірскай губ. Вял. значэнне мела экспедыцыя І. І. Жылінскага па асушэнні Палесся (1873—97), у якой прынялі ўдзел глебазнавец В. В. Дакучаеў і батанік Г. І. Танфільеў, што апублікаваў першую ў Расіі класіфікацыю балотаў. У 1885 батанік І. Клінге ўпершыню ў Расіі ў Юр'еўскім ун-це прачытаў курс Б. У 1898 А. В. Фамін прапанаваў раяніраванне балотаў Еўрап. Расіі. У 1910 створана Балотная доследная станцыя ў Тоома (Эстонія). У 1911 адкрыта Балотная станцыя ў Мінску пад кіраўніцтвам А. Ф. Флярова і А. Т. Кірсанава. Беларусь стала цэнтрам вывучэння і практычнага выкарыстання балотаў Расіі. У 1912—15 у Мінску выдаваўся час. «Болотоведение» (з № 3 1915 выходзіў у Маскве). У пач. 20 ст. вялікі ўклад у развіццё Б. зрабілі У. М. Сукачоў, А. Ф. Фляроў, В. Р. Вільямс, У. С. Дакуроўскі, які для вывучэння балотаў ужыў метад пылковага аналізу. У 1930 на базе Мінскай доследнай балотнай станцыі створаны Усесаюзны НДІ балотнай гасп. (з 1956 *Меліярацыі і воднай гаспадаркі Беларускі навукова-даследчы інстытут*).

У Мінску знаходзіцца Інстытут торфу АН БССР. Вывучаюць балоты Гідралагічны ін-т у Ленінградзе, Калінінскі політэхн. ін-т. Вядомыя балотазнаўцы Беларусі І. С. Лупіновіч, А. П. Підоплічка, З. М. Дзянісаў, С. Г. Скарапанаў. Б. мае практычнае значэнне для меліярацыйнага буд-ва і выкарыстання торфу ў прамысловасці і с. гасп.

Літ.: Ниценко А. А. Краткий курс болотоведения, М., 1967; Пьявченко Н. И. Лесное болотоведение, М., 1963; гл. таксама літ. пры арт. *Балоты*.

Т. А. Раманава. Мінск.

«БАЛОТНАЯ ЛІХАМАНКА», умоўная назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх акупантаў у жн. — вер. 1942 супраць партызанаў і мірнага насельніцтва Віцебскай і Мінскай абл. Барацьбу з партызанамі гітлераўцы выкарыстоўвалі як зачэпку для масавага знішчэння мірнага насельніцтва. У час аперацыі «Б. л.», паводле справаздачы яе кіраўніка обергрупенфюрэра СС Экельна, знішчана 389 партызанаў і 9626 чал. мірнага насельніцтва; 1217 чал. «эвакуіравана», г. зн. большасць загублена, а працаздольныя вывезены на катаржныя работы ў Германію. У мяст. Мсціж Вягомльскага р-на карнікі сагналі моладзь у хлеў і спалілі; дарослых мужчын расстралялі ў склепе, а жанчын, дзяцей і старых закідалі гранатамі ў хатах і спалілі. Гітлераўцы абрабавалі вёскі, забралі жывёлу, харч. прадукты і інш. маёмасць.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944, Мн., 1965, с. 42; Немецко-фашистский оккупационный режим (1941—1944). М., 1965, с. 319—330, 379—386.

БАЛОТНІКАЎ Іван Ісаевіч (г. н. невяд.— п. 1608), кіраўнік антыфеадальнага паўстання сялян і халопаў 1606—07 у Расіі. З халопаў, у маладосці збег да казакоў. Быў у тат. палоне, рабом на тур. галерах, адтуль уцёк. Жыў у Венецыі, потым цераз Польшчу вярнуўся ў Расію. Назваўшы сябе ваяводам царэвіча Дзмітрыя, летам 1606 узначаліў сялянскае паўстанне, якое ахапіла вялізную тэр. поўдня Расіі. Да паўстанцаў далучыліся апалчэнцы многіх гарадоў, казакі, атрад вольніцы з Беларусі і інш. Пасля многіх перамог над арміяй цара Васіля Шуйскага шматтысячныя войскі Б. асадзілі 22.10.1606 Маскву. Але горад не быў узяты, і ў снеж. 1606 Б. адступіў да Калугі, дзе вытрымаў доўгую асаду. У маі 1607 Б. разбіў асадныя войскі, а ў чэрв. 1607 зноў быў асаджаны ў Туле. Царскія войскі затапілі горад вадою. Паверыўшы ў абяцаную царом літасць, 10.10.1607 паўстанцы здаліся. Б. ў Каргапальскай турме выкалалі вочы, потым утапілі. Гл. таксама *Сялянская вайна пад кіраўніцтвам І. І. Балотнікава* (1606—07).

БАЛОТНЫ БАБЁР, гл. *Нутрыя.*

БАЛОТНЫ ГАЗ, гл. *Метан.*



БАЛОТНЫ МІРТ, каса н д р а (Chamaedaphne), род вечназялёных кусцікаў сямейства верасовых. Сцяблы шаравата-бурыя, выш. 17—50 *см*. Лісце скурыстае, ланцэтападобнае. Кветкі белыя паніклыя, у аднабокіх гронках. Вядомы адзін від — Б. м. звычайны (C. calyculata), пашыраны ў тундравай і лясной зонах Еўропы, Азіі, Паўн. Амерыкі. Расце на тарфяных балотах. Мае гліказід андрамедатаксін, атрутны для коз і авечак.

БАЛОТНЫ МЫШАЛОЎ, ч а р о т а в ы м ы ш а л о ў, б а л о т н ы ш у л я к (Circus aeruginosus), драпежная птушка сямейства ястрабіных. Даўж. да 60 *см*, маса каля 600 *г* (самка большая за самца). Апярэнне цёмна-бурае, верх галавы ў маладых вохрысты, у дарослых белаваты з цёмнымі штрыхамі. Пашыраны ў Еўропе, Афрыцы, Аўстраліі, Тасманіі і Новай Зеландыі; у БССР — па ўсёй тэр., асабліва многа на Палессі. Насяляе адкрытыя балотныя прасторы з зараснікамі чароту, берагі



рэк і азёраў. Гнёзды ў выглядзе вялікай кучы (да 1 *м* у дыяметры) робіць з чаротавых сцяблоў. Нясе 4—6 яец. Корміцца вадаплаўнымі і балотнымі птушкамі, вадзянымі пацукамі і інш. У паляўнічых гасп. колькасць Б. м. рэгулюецца.

БАЛОТНЫЯ АДКЛАДЫ, арганічныя і мінеральныя адклады, якія ўтвараюцца ў балотах. Пераважна гэта торф з рэшткаў балотных раслін, якія раскладаюцца часткова і ў такім стане захоўваюцца ў тарфяной залежы. Асноўныя ўласцівасці торфу фарміруюцца ў верхнім торфаўтваральным гарызонце (ад 3—5 да 30 *см* і болей).

Часам у тарфяным пакладзе нізінных балотаў адкладваюцца прынесеныя грунтавымі водамі вокіслы кальцыю, жалеза і інш. Яны ўтвараюць праслоі, лінзы або ўкрапванні тарфатуфу, прэснаводнага мергелю, *балотных рудаў, вохры, вівіяніту* і інш. Тарфатуфы і мергель могуць залягаць на ўсю тоўшчу тарфянога пакладу або ў выглядзе праслояў ці лінзаў. Асабліва вял. паклады тарфатуфаў на балотах Кабыляніскім Гомельскага і Бярэзінскім Маладзечанскага р-наў. Вохра звычайна залягае прапластаваннямі да 0,8 *м* у верхніх ч. тарфянога пакладу (б-та Дзяржынскае ў Дзяржынскім р-не і інш.). Пад уплывам дэлювіяльных працэсаў магчымыя праслоі і лінзы пяску ці гліны.

А. П. Підоплічка. Мінск.

БАЛОТНЫЯ РУДЫ, скопішчы жалезістых і інш. мінералаў (*ліманіту, сідэрыту, вівіяніту*, радахразіту і інш.), што ўтварыліся ў балотах і азёрах, якія маюць мяшанае жыўленне і зарастаюць. Крыніцы мінер. рэчываў — грунтавыя і мінер. воды. Найб. пашыраны жалезістыя Б. р., шматлікія паклады якіх сустракаюцца ў зоне ўмеранага клімату (у СССР, Фінляндыі, Швецыі, Канадзе). На Беларусі (пераважна на Палессі) вядома каля 150 радовішчаў.

Б. р. ўтвараюць зямлістыя (парашковыя) агрэгаты, канкрэцыі (бабовыя руды), наздраватыя сцягванні і шчыльныя залежы ў форме слаёў, лінзаў магутнасцю да 30 *см*. Плошча залежаў да 5 *га*, запасы не перавышаюць некалькіх соцень, радзей тысяч тон. Залягаюць на паверхні або спрод тарфянікаў. Маюць 18—34% жалеза. Са стараж. часоў выкарыстоўваліся для вытв. жалеза. На Беларусі распрацоўваліся з 16 ст. на мясцовыя патрэбы і на вывад. Жалезаплавільні існавалі на Палессі, каля Барысава і ў іншых месцах, дзе збераглісяадвалы і характэрныя для многіх населеных пунктаў назвы Рудня. Страцілі значэнне як металург. сыравіна, але ўжываюцца мясцовай прамысл. для вырабу танных мінер. фарбаў (вохры, сурыку, мумію і інш.).

БАЛОТНЯ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 48 *км* на ПнУ ад Рагачова, 103 *км* ад Гомеля, каля шашы Бабруйск — Крычаў (3 *км*). 480 ж., двароў 140 (1970). Цагельня. Сярэдняя школа, б-ка, клуб, фельч.-ак. пункт, магазін. У Б. брацкія магілы 354 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАЛОТЧЫЦЫ, вёска ў Беліцкім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 25 *км* на ПдЗ ад Слуцка, 120 *км* ад Мінска. 1297 ж., двароў 340 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт. Чатыры брацкія магілы і помнік-абеліск сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАЛОТЫ, элементы ландшафту, што характарызуюцца павышанай вільготнасцю, спецыфічнай балотнай раслінnасцю, у выніку жыццядзейнасці і адмірання якой адбываецца працэс торфаўтварэння. Утвараліся гал. ч. у розны час *галацэну* (ад 10—12 тыс. г. таму назад і да нашага часу) шляхам забалочван-




Схема будовы нізінных (I—II) і вярховых (III) балот. Торф: *1* — асаковы; *2* — драўляна-трысняговы; *3* — трысняговы; *4* — драўляны; *5* — гіпнавы; *6* — сфагнавы; *7* — хваёва-пушыцавы; *8* — шэйхцэрыевы; *9* — тарфатуфы; *10* — сапрапель; *11* — прэснаводны мергель.

ня сухадольных аблесеных і бязлесных нізін або пры затарфоўванні вадаёмаў. Агульная плошча Б. зямнога шара 350 млн. *га*, 73% на тэр. СССР (у Еўрап. ч. СССР каля 90 млн. *га*). Сярэдняя забалочанасць у тундравай зоне каля 70%, у хвойна-лясной 30%, у асобных раёнах Кольскага п-ва і ўзбярэжжа Белага м. да 90%. У залежнасці ад характару мінер. жыўлення Б. падзяляюцца на нізінныя (эўтрофныя), вярховыя (алігатрофныя) і пераходныя (мезатрофныя). У лясной зоне, у т. л. на Беларусі, ёсць тры тыпы Б.

Нізінныя ў неасушаным стане звычайна маюць увагнутую або плоскую паверхню. Бываюць аблесеныя (вольха, клейкая бяроза, хвоя, елка, кусты вярбы, пераважна шэрай і ніцай лазы размарыналістовай) і бязлесныя, укрытыя травяністай і мохавай раслін-



насцю: асокі, чарот, пажарніца, разнатраўе (бабоўнік, касач, вятроўнік і інш.), зялёныя і сфагнавыя імхі. У нізінных Б. утвараюцца асаковы, чаротавы, чаротава-асаковы, драўняна-асаковы, драўняна-чаротавы, асаковагіпнавы, драўняны і інш. віды *торфу*, тарфатуфы і інш. *балотныя адклады*.

Вярховыя маюць выпуклую паверхню. На Палессі і ў цэнтр. ч. Беларусі выпукласць складае 1—2 *м* вышэй краёў (Дукора Пухавіцкага і Дзікае Глускага р-наў), на ПнЗ БССР да 5—7 *м* (Даўбянішкі, Скураты, Ельня Шаркоўшчынскага р-на і інш.). Вярховыя Б. звычайна аблесены балотнымі формамі хвоі, але бываюць і бязлесныя; амаль заўсёды ўкрыты сфагнавымі імхамі, каля краёў могуць быць купіны падвею. У раслінным покрыве звычайна кусцікі верасовых (часцей багун, андрамеда, журавіны, касандра, буякі і інш.), падвей аднагаловы, шэйхцэрыя, чаротнік, сфагнавыя імхі, расянка, часам багноўка. Адкладаюцца сфагнавы, падвейны, хваёва-падвейны, шэйхцэрыева-сфагнавы і інш. віды торфу. У тарфяным пакладзе вельмі часта вярховы торф падсцілаецца нізінным і пераходным.

Пераходныя маюць кампаненты нізіннага і вярховага тыпу расліннасці, і звычайна адклады іх з'яўляюцца пераходам ад нізіннай да вярховай часткі тарфянога пакладу. У лясной зоне ўмеранага клімату на Беларусі ёсць тры тыпы Б.

Паводле ўмоў жыўлення адрозніваюць Б. рачнога жыўлення, азёрнага, напорна-грунтавога, далювіяльнага і атмасфернага. Паводле ўмоў залягання вылучаюць Б.: пойменныя, прытэраснага і плакорнага залягання, рознага характару далін, а таксама схілаў. Характар абваднення Б. вызначае не толькі асаблівасці развіцця расліннага покрыва і састаў торфу, а і ступень разлажэння масы адмерлых раслін-торфаўтваральнікаў. Паверхня Б. можа быць роўная



Балота Паддубічы ў Столінскім раёне. Нізінны ўчастак.

або куп'істая. Найбольш вял. купіны (да 1 *м*) узнікаюць каля ствалоў вольхі ў алешніках, на адкрытых асаковых Б. утвараюцца куп'істыя асоці. На вярховых Б., асабліва на Пн рэспублікі, пашыраны градава-мачажынныя комплексы, якія на Пд менш выразныя.

На Беларусі зарэгістравана 6925 Б. Агульная пл. 2,5 млн. *га* з запасам торфу-сыравіны 30,4 млрд. $м^3$. Сярэдняя глыб. пакладаў торфу 1,87 *м*. Найб. магутнасць тарфянога пласта ў БССР дасягае 11,5 *м* (балота Арэхаўскі



Балота Паддубічы ў Столінскім раёне. Вярховы ўчастак.

Мох Пухавіцкага р-на). Найбольшыя Б. (пл., тыс. *га*): у Столінскім р-не Паддубічы, 48,2; у Івацэвіцкім, Ляхавіцкім і Ганцавіцкім р-нах Выганашчанскае, 48,0; у Кобрынскім і Драгічынскім Вялікі Лес, 40,0; у Лунінецкім і Салігорскім Грычын, 32,9; у Бярозаўскім і Івацэвіцкім Аброўскае, 32,1; у Лунінецкім Хольча, 25,6; у Міёрскім Ельня, 19,4. Больш за 67% вялікіх, але не глыбокіх (глыб. пакладу да 1,3 *м*) балотаў рэспублікі у Брэсцкай вобл. Усе яны нізінныя. Паводле асаблівасцей развіцця балотаў і торфаўтварэння на Беларусі вылучаюцца наступныя тарфяна-балотныя вобласці (гл. карту): 1) вярховых Б. узгорыста-азёрнага ландшафту; 2) нізінных Б. заходняга канцовамарэннага ландшафту; 3) вялікіх вярховых і нізінных Б. пакатава-хвалістай абляцыйнай раўнінны; 4) невялікіх вярховых і нізінных Б. ва ўмовах значнага пашырэння лёсавых парод; 5) вялікіх нізінных Б. Палесся.

Характар развіцця балотаў БССР вызначаецца ўмовамі залягання і жыўлення. Там, дзе пераважае беднае атмасфернае жыўленне, развіваюцца вярховыя Б. (Дзісненская нізіна ў Віцебскай вобл.. Друць-Бярэзінскае міжрэчча і інш.), а дзе пераважае грунтавое і інш. багатае мінер. жыўленне, балотныя масівы амаль цалкам нізінныя (Гродзенская і большая ч. Брэсцкай вобл.). У інш. раёнах размяшчанне нізінных і вярховых балотаў у розных суадносінах (Мінская і Магілёўская вобл.). На перасечанай мясцовасці Б. многа, але яны невялікія, на раўнінных тэрыторыях (Дзісненская нізіна, Палессе і інш.) яны вялікія, нярэдка да 15 тыс. *га* і больш. На Б., якія ўтварыліся на месцы былых азёр, пад торфам знаходзяць адклады *сапрапелю*. На Беларусі пад торфам выяўлена больш за 220 радовішчаў сапрапелю. Сярэдняя магутнасць пласта 0,57 *м* — 1,07 *м*, агульны запас (млн. $м^3$) 342, з іх у Брэсцкай вобл. 80, Віцебскай 145, Гомельскай 5, Гродзенскай 36, Мінскай 62, Магілёўскай 14.

Тыпалагічная характарыстыка балот па адміністрацыйных абласцях (1970)

Паказчыкі	Вобласці						Усяго па рэспубліцы
	Брэсцкая	Віцебская	Гомельская	Гродзенская	Магілёўская	Мінская	
Плошча балотаў, тыс. *га*	661,4	356,7	503,5	164,7	219,2	576,0	2481,5
у т. л.:							
вярховыя, %	4,8	40,4	11,8	3,8	28,6	10,9	15,6
пераходныя, %	6,1	4,3	3,1	0,4	2,7	1,0	3,2
нізінныя, %	89,1	55,3	85,1	95,8	68,7	88,1	81,2
Затарфаванасць тэрыторыі, %	20,2	9,4	11,9	7,0	8,2	15,8	12,4
Сярэдняя глыбіня пакладу торфу, *м*	1,43	2,6	1,65	1,96	1,93	1,95	1,87
Колькасць балотаў	444	1775	1452	377	1638	1239	6925

Асушаныя нізінныя Б. шырока выкарыстоўваюцца як пасяўныя плошчы і сенажаці, для здабычы торфу на ўгнаенне, на тарфяны подсціл, на паліва для эл. станцый і бытавых патрэб. Вядуцца значныя меліярац. работы па асушэнні і асваенні Палесся, дзе ёсць вялікія масівы нізінных Б. (гл. *Асваенне асушаных зямель, Меліярацыя*). На вярховых і пераходных Б. збіраюць журавіны (да 1,5 *т/га*) і буякі. Слаба разложаны сфагнавы торф вярховых балотаў (Ельня, Даўбянішкі, Скураты Шаркоўшчынскага р-на; Вялікі Мох Міёрскага; Обаль ІІ Шумілінскага; Габы Докшыцкага; Слаўнае, Эсьмонаўскі Мох, Заазер'е і Астравы Дулебы Бялыніцкага; Кандаль-Яловец Лельчыцкага р-наў і інш.) можа ўжывацца на подсціл жывёле, як упаковачны матэрыял, для вырабу ізапліт, вырошчвання кармавых дражджэй, атрымання стымулятараў росту раслін і жывёл. З торфу вярховых і пераходных балотаў са ступенню разлажэння 30% і больш можна атрымліваць сарбіравальныя вугалі і прэс-парашкі, тарфяны воск, тарфашчолачныя рэагенты і інш. (Слаўнае, Астравы Дулебы, Заазер'е, Залітвінскі Мох, Тажылаўскае, Хачынка, Кандаль-Ялавец і інш. Б.). Доследныя работы па асваенні і культуры балотаў у СССР вядуцца НДІ, доследнымі балотнымі станцыямі. Створаны Палескі, Белавежскі, Бярэзінскі запаведнікі (агульн. пл. Б. 87 155 *га*), а таксама заказнікі на балотах Выганашчанскае, Ельня і Заазер'е (агульн. пл. 63 072 *га*). Гл. *Балотазнаўства*.

Літ.: Кац Н. Я. Типы болот СССР и Западной Европы и их географическое распространение, М., 1948; Лупиновичи И. С. и Голуб Т. Ф. Торфяно-болотные почвы БССР и их плодородие, Мн., 1958; Пидопличко А. П. Торфяные месторождения Белоруссии, Мн., 1961; Скоропанов С. Г. Освоение и использование торфяно-болотных почв, Мн., 1961; Сукачев В. Н. Болота, их образование, развитие и свойства, 2 изд., П., 1923; Танфильев Г. И. Болота и торфяники Полесья, СПб., 1895; Kulczyński St. Torfowiska Polesia, t. 1—2, Kraków, 1939—40; гл. таксама літ. пры арт. *Балотазнаўства*. *А. П. Підоплічка*. Мінск.

БАЛОТЫ (Вялікія Балоты), вёска ў Кіслявіцкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 15 *км* на ПдУ ад Кобрына, 67 *км* ад Брэста, 16 *км* ад чыг. ст. Кобрын. 998 ж., гасп. 291 (1970). Сярэдняя школа, клуб, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін. У Айчынную вайну фашысты расстралялі 29 жыхароў вёскі.

БАЛОЦІН Ісідар Міхайлавіч [сапр. Балотны Ізраіль Рувімавіч; 26.8(8.9).1907, Бабруйск — 7.12.1961], беларускі савецкі спявак (лірычны тэнар). Нар. арт. БССР (1944). Чл. КПСС з 1943. У 1930 скончыў Бел. муз. тэхнікум па класе А. Баначыча. Дэбютаваў у партыі Звездачота («Залаты пеўнік» М. Рымскага-Корсакава, Бел. студыя оперы і балета, 1931). Саліст Бел. т-ра оперы і балета з часу яго заснавання (1933). Выступаў у нац. операх: Саўка («У пушчах Палесся» А. Багатырова), Конрад («Кветка шчасця» А. Тураніка), Сёмка («Алеся» Я. Цікоцкага). Лепшыя партыі опернай класікі: Ленскі («Яўген Анегін» П. Чайкоўскага), Дуброўскі («Дуброўскі» Э. Напраўніка), Юродзівы («Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага), Герцаг («Рыгалета» Дж. Вердзі), Альмавіва («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Надзір («Шукальнікі жэмчугу» Ж. Бізэ), Вашак («Прададзеная нявеста» Б. Сметаны), Дамазы («Страшны двор» С. Манюшкі). Б. меў гібкі, выразны голас, ярка раскрываў вобразы вакальнымі сродкамі, быў майстрам вострахарактарнага сцэнічнага малюнка. Яго канцэртны рэпертуар вялікі і разнастайны. Дэп. Вярх. Савета БССР 2—4-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



І. М. Балоцін у ролях Сёмкі (злева) і Надзіра.





Літ.: Смольскі Б. Таленавіты спявак (І. М. Балоцін), у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960. *А. А. Ракава*. Мінск.

БАЛОЦІНА Анісся Давыдаўна (1865, г. Мсціслаў — г. см. невяд.), удзельніца рэвалюцыйнага руху 80-х г. 19 ст. З мяшчан. У час навучання ў вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства ў Маскве ўваходзіла ў гурток нарадавольцаў, удзельнічала ў друкаванні і распаўсюджванні нелегальнай л-ры. Арыштавана 31.3.1886 па даносе С. В. Зубатава, які выдаў паліцыі гурток. 16.7.1887 выслана на 8 гадоў у Сібір. За ўдзел ва ўзбр. выступленні ссыльных у Якуцку 22.3.1889, дзе была паранена, ваенна-судовая камісія прыгаварыла яе да пазбаўлення ўсіх правоў і пажыццёвай катаргі. Пакаранне адбывала ў Вілюйскай катаржнай турме і ў турме для асабліва небяспечных паліт. злачынцаў на Кары. З вер. 1893 на вольным пасяленні. З кастр. 1897 жыла ў Шклове Магілёўскай губ. пад наглядам паліцыі. У чэрв. 1898 выехала за мяжу.

М. В. Віч. Мінск.

БАЛТРАМАЙЦІС (Baltramaitis) Сільвестрас (21.10.1841 — п. каля 1918), літоўскі бібліёграф і этнограф. У 1869—1918 працаваў у Пецярбургскай публ. б-цы. Падрыхтаваў каштоўныя бібліяграфічныя зборнікі пра Літву і літ. народ (выдадзены ў 1891 і 1904 у Пецярбурзе). Зарэгістраваў каля 20 тыс. кніг, артыкулаў, рэцэнзій. Асн. праца Б.— «Зборнік бібліяграфічных матэрыялаў для геаграфіі, гісторыі, гісторыі права, статыстыкі і этнаграфіі Літвы» (2 выд., 1904, з дадаткам спісу літоўскіх і старажытнапрускіх кніг, выдадзеных у 1533—1903), у якой зарэгістраваны творы П. Бабоўскага, М. Доўнар-Запольскага, П. Жуковіча, Я. Карскага, А. Кіркора, М. Каяловіча, М. Любаўскага, А. Сапунова, Я. Чачота і інш. па геаграфіі, прыродзе, гісторыі, статыстыцы і этнаграфіі Беларусі.

Н. Б. Ватацы. Мінск; *П. Г. Маргелічус.* Вільнюс.

БАЛТУШЫС (Baltušis) Юозас (сапр. Альбертас Юазенас; н. 14.4.1909, Рыга), літоўскі савецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Нар. пісьменнік Літ. ССР (1969). Засл. дз. маст. Літ. ССР (1954). Чл. КПСС з 1943. У 1959—67 нам. старшыні Прэзідыума Вярх. Савета Літ. ССР. З рабочых. Быў парабкам, рабочым друкарні. У 1946—54 рэдактар час. «Pergalė» («Перамога»). Друкуецца з 1932. У зб. апавяданняў «Тыдзень пачынаецца добра» (1940) праўдзіва апісвае быт працоўных бурж. Літвы; у зб. «Дзяцеліна» (1943) — гераічную барацьбу літ. народа з гітлераўскімі акупантамі. Напісаў п'есы «Спяваюць пеўні» (1947), «Ранім ранкам» (1953). У рамане «Прададзеныя гады» (т. 1, 1957, т. 2, 1969) паказаў падняволнае жыццё парабкоў у бурж. Літве, раскрыў духоўнае багацце працоўнага народа. Зб. апавяданняў «Валюсе патрэбен Алексас» (1965) прысвечаны маральным праблемам. Аўтар кн. нарысаў «Пра што ў песні не пяецца» (1959), «Па сцежках бацькоў і братоў» (1967).

Тв.: Бел. пер.— Праданыя гады, Мн., 1961; у зб.: Літоўскія апавяданні, Мн., 1957; рус. пер.— Избранное, Вильнюс, 1953; О чем песни не сложены, М., 1965.

В. Бержыніс. Вільнюс.

БАЛТЫ, група індаеўрапейскіх плямёнаў, якія гаварылі на балтыйскіх мовах. Тэрмін «балты» (ад Балтыка) увёў у 1845 ням. філолаг Г. Несельман. Паводле звестак археалогіі і мовазнаўства фарміраванне Б. адбывалася ў эпоху позняга неаліту і бронзы (канец 3—2-е тысячагоддзі да н. э.). Мяркуюць, што ў жалезным веку (7 ст. да н. э.—4 ст. н. э.) Б. засялялі басейны Нёмана, Зах. Дзвіны і Верхняе Падняпроўе. На Пд і ПдУ іх суседзямі былі іранскія плямёны (скіфы, потым сарматы) і славяне, што жылі ў бас. Прыпяці, на Пн і ПнУ фіны, на З і ПдЗ славяне (у бас. Віслы і Паўд. Прыбалтыцы) і германцы. У пісьмовых крыніцах балцкія плямёны ўпершыню ўпамінаюцца ў канцы 1 ст. н. э. (Тацыт); у скандынаўскіх хроніках 9 ст.— куршы, земгалы, прусы; у старажытнарус. летапісах (11 ст.) — куршы, латгалы, прусы, ятвягі, пазней (12 ст.) — літва, жмудзь і інш. Плямёны Б., якія жылі на тэр. сучаснай Беларусі і Смаленшчыны, былі асіміляваны славянамі. На астатняй тэр. ў пач. 2-га тысячагоддзя на базе стараж. балтыйскіх плямёнаў пачалі складвацца народнасці: літоўцы, латышы, прусы, ятвягі. Па мове Б. падзяляліся на заходніх (прусы, ятвягі) і ўсходніх (літоўцы, латышы, куршы і інш.). У 13 ст. ў выніку агрэсіі крыжаносцаў прусы і часткова ятвягі былі знішчаны.

Літ.: Третьяков П. Н. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге, М.—Л., 1966; Мажюлис В. Лингвистические заметки к балтийскому этногенезу, М., 1964; Топоров В. Н. и Трубачев О. Н. Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепровья, М., 1962; Моора Х. А. О древней территории расселения балтийских племен, «Советская археология», 1958, № 2.

А. Р. Мітрафанаў. Мінск.

БАЛТЫЙСКАЕ МОРА (у стараж. славян Варажскае), унутрымацерыковае мора Атлантычнага ак. Злучаецца з акіянам пралівамі Эрэсун, Вял. і Малы Бельт, Катэгат, Скагерак і далей праз Паўночнае м. Абмывае берагі СССР, Польшчы, ГДР, ФРГ, Данії, Швецыі, Фінляндыі. Пл. 386 тыс. км². Пераважае глыб. 60—130 м, найб. 459 м. Залівы: Батнічны, Фінскі, Рыжскі. Астравы: Котлін, Сарэма, Муху, Хіума (СССР), Готланд, Эланд (Швецыя), Борнхольм (Данія), Руген (ГДР), Аландскія (Фінляндыя). Паўн. берагі моцна парэзаны, шхерныя і фіёрдавыя; паўд.— нізінныя, пясчаныя з водмелямі і дзюнамі.

У эпоху абледзянення тэр. цяперашняга Б. м. была ўкрыта мацерыковым лёдам. Пасля адступлення ледавіка ўзнікла Іольдыевае мора. У выніку паступовага падымання сушы сувязь з інш. морамі знікла і ўтварылася Анцылавае воз. Калі аднавілася сувязь з Паўн. м., узнікла Літарынавае м., папярэднік сучаснага Б. м. Геал. падыманне сушы адбываецца і цяпер.

Рэльеф дна значна расчлянёны. У Б. м. ўпадаюць Нява, Даўгава, Нёман, Вісла, Одра і інш. Клімат пераходны ад акіянічнага да мацерыковага. Сярэдняя т-ра лютага 0 на З. —3 на У, у Фінскім зал. да —8 °С; у жн. ад 15 да 17 °С. Ападкаў па Пн 500 мм, на Пд да 600 мм, у асобных месцах да 1000 мм за год. Частыя туманы (да 59 дзён за год). Т-ра паверхневых водаў зімой ад 1 да 3, у бухтах і залівах ніжэй за 0; летам ад 18 да 20 °С. Салёнасць вады на паверхні 11‰ на З, 6‰—8‰ у цэнтр. частцы, 2‰ на Пн. Узбярэжная

ч., залівы і бухты замярзаюць з ліст. — снежня да сак.— красавіка. У адкрытым моры лёд утвараецца толькі на Пн. Пастаянныя цячэнні супраць гадзіннікавай стрэлкі, слабыя. Пад уплывам ветру існуюць згонна-нагонныя цячэнні. Ад ветравых нагонаў падымаецца ўзровень вады ва ўсх. частцы Фінскага зал. (ленінградскія паводкі). Прылівы паўсутачныя, 0,1—0,6 м. Фаўна бедная па відах, але багатая колькасцю: атлантычны селядзец (салака), анчоўс, кілька, траска, сіг, акунь, ласось, рачны вугор, палтус. З млекакормячых балтыйскі цюлень. Б. м.— марскі шлях, які злучае балт. дзяржавы з усімі портамі свету. Асн. порты: у СССР — Ленінград, Талін, Рыга, Ліепая, Клайпеда, Калінінград; у Польшчы — Гданьск, Гдыня, Шчэцін; у Данії — Капенгаген; у Швецыі — Стакгольм, Мальмё; у Фінляндыі — Хельсінкі, Турку, Котка; у ГДР — Ростак; у ФРГ — Кіль.

Літ.: Добровольский А. Д. и Залогин Б. С. Моря СССР, М., 1965.

В. К. Гудзеліс. Вільнюс.

БАЛТЫЙСКАЯ ГРАДА, палоса градаваўзгорыстага рэльефу эпохі апошняга абледзянення ў Еўропе. Выразна акрэсленая ад Данії да Зах. Дзвіны. Асобныя яе часткі маюць назвы: у Германіі — Мекленбургскае азёрнае плато, у Польшчы — Паморскае і Мазурскае паазер'і. Выш. каля 250—330 м. На тэр. БССР да Б. г. адносяцца Браслаўская (выш. да 210 м), Асвейская і частка Латгальскай сістэмы градаў. Рэльеф паўн. часткі Б. г. ўзгорыста-раўнінны, паўднёвай — буйна- і градава-ўзгорысты.

БАЛТЫЙСКАЯ СЕРЫЯ, тоўшча горных парод у геалагічным разрэзе ніжняга кембрыю на захадзе Рускай платформы. Адпавядае ровенскай, стаходскай світам і беражкоўскай серыі Украіны, тыгецкай і філіпенскай світам Малдавіі. У Прыбалтыцы і Ленінградскай вобл. ў Б. с. аб'ядноўваюць адклады ламаносаўскай, лантаваскай і пірытаскай світ. Б. С. Сакалоў супастаўляе яе па комплексе фаўны з пізамі ніжняга кембрыю Англіі і Польшчы. На Беларусі складзена знізу з кварцавых і палёва-шпатава-кварцавых з глаўканітам пясчанікаў (гарызонт надляміпарытавых пясчанікаў), вышэй — з глінаў з праслойкамі алеўралітаў і пясчанікаў (гарызонт сініх глінаў), месцамі вышэй залягаюць вафітонавыя пясчанікі. Магутнасць адкладаў 8—200 м і больш. Ніжнекембрыйскі ўзрост Б. с. падаецца паводле комплексу акрытархаў і вызначэнняў абс. ўзросту па глаўканіце (500—550 млн. гадоў).

БАЛТЫЙСКІ ФЛОТ, састаўная частка ВМФ СССР. Засн. на Балтыйскім м. ў час Паўночнай вайны 1700—21 Пятром I. Забяспечваў абарону марскіх портаў і ўзбярэжжа Расіі на Балтыйскім м., падтрымліваў прыморскія флангі сухап. войск у час войнаў, адстойваў інтарэсы краіны на інш. марскіх тэатрах. Сусветна вядомыя яго перамогі над флотамі замежных дзяржаў каля Гангута (1714), Чэсмы (1770), Рэвеля (1790), Афона (1807), Наварына (1827). Праславіўся геагр. адкрыццямі і даследаваннямі (экспедыцыі І. Ф. *Крузенштэрна*, Ф. Ф. *Белінсгаўзена*, М. П. *Лазарава*, Г. І. Невяльскога), працамі рус. вучоных і вынаходнікаў А. С. *Папова*, А. Ф. Мажайскага, А. М. *Крылова*, Ю. М. *Шакальскага* і інш. Б. ф. мае выдатныя рэвалюц. традыцыі. Яго маракі актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыях 1905—07, Лютаўскай 1917. У пач. кастр. 1917 яны паказалі гераізм у барацьбе з ням. флотам за Маанзундскі архіпелаг. Вялікую ролю флот адыграў у час падрыхтоўкі і правядзення Кастр. ўзбр. паўстання 1917 у Петраградзе і ў разгроме контррэвалюц. сіл інтэрвентаў і белагвардзейцаў на франтах грамадз. вайны. У Вял. Айч. вайну маракі Б. ф. з воінамі Сав. Арміі гераічна абаранялі Ленінград, садзейнічалі разгрому ням.-фаш. захопнікаў пад Ленінградам, на Карэльскім перашыйку і ў Прыбалтыцы. Яны знішчылі і пашкодзілі сотні варожых караблёў і транспартаў. Больш за 20 караблёў і часцей флоту сталі гвардзейскімі, 58 караблёў узнаг. ордэнамі СССР. 137 афіцэраў, старшын і матросаў Балтыкі атрымалі званне Героя Сав. Саюза, больш за 100 тыс. узнаг. ордэнамі і медалямі. У 1941—43 камандуючым эскадры Б. ф. быў ураджэнец Гомельшчыны віцэ-адмірал В. П. *Дрозд*. Б. ф. двойчы ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга (1928, 1965). З 1923 над Б. ф. шэфствуе ЛКСМБ.

Літ.: Гречанюк Н. и др. Балтийский флот, М., 1960; Балтийский флот в Октябрьской революции и гражданской войне, М.—Л., 1932; Ачкасов В. и Вайнер Б. Краснознаменный Балтийский флот в Великой Отечественной войне, М., 1957; Петрашкевич А. и Елисов С. Шеф Краснознаменной Балтики, Мн., 1963.

В. Я. Надводскі. Ленінград.

БАЛТЫЙСКІ ШЧЫТ, вялікае ўзвышэнне крышталічнага фундамента на ПнЗ Усх.-Еўрап. платформы (Карэльская АССР, Кольскі п-аў, Фінляндыя, Швецыя). Моцна дыслакаваныя метамарфічныя пароды крышталічнага фундамента, пераважна гнейсы і крышталічныя сланцы, прарваныя магматычнымі пародамі, залягаюць неглыбока або на паверхні.

У СССР, дзе размешчана ўсх. частка шчыта, вылучаюцца раёны: паўн.-ўсх.— Кольскі, цэнтр.— Беламорскі і паўд.-ўсх.— Карэльскі. Складкавыя структуры Беламорскага р-на былі ўтвораны ў археі, Кольскага і Карэльскага — у пратэразоі. У апошніх вылучаюцца ніжнепратэразойскі (раннія карэліды), сярэднепратэразойскі (позніе карэліды) і верхнепратэразойскі структурныя комплексы.

Асадкавы чахол на большай частцы Б. ш. адсутнічае. На працягу геал. гісторыі ад палеазою да нашых дзён Б. ш. перыядычна ўздымаўся і быў вобласцю зносу, што абумовіла яго глыбокую *дэнудацыю*. Сучасная скорасць падымання 1 см за год. У антрапагенавы перыяд — цэнтр мацерыковых абледзяненняў Еўропы. Характэрны згладжаныя круглявыя формы ўзвышшаў, барановы лбы, выараныя катлавіны азёраў і інш. формы ледавіковага рэльефу. У межах Б. ш. вядомы радовішчы жалеза (Кіруна, Аленягорскае і інш.), медна-нікелевых рудаў (Манчатундра, Печанга), апатыту (Хібіны).

БАЛТЫЙСКІЯ МОВЫ, самастойная група *індаеўрапейскіх моў*. Да іх належаць *літоў-*

ская мова і *латышская мова*, а таксама мёртвыя — пруская мова (была пашырана на тэр. Усх. Прусіі, канчаткова знікла ў 18 ст.) і балтыйскія дыялекты: ятвяжскі (Паўн.-Усх. Польшча, Паўд. Літва і Зах. Беларусь), куршскі (балтыйскае ўзбярэжжа ў межах сучасных Латвіі і Літвы) і інш.

На Б. м. гаворыць больш за 3,5 млн. чал. Надзвычай дыферэнцыраваныя ў дыялектных адносінах. Паводле грамат. ладу мовы флектыўныя, маюць развітую сістэму склянення, вызначаюцца складанай будовай слова. Сінтакс. сувязі выражаюцца формамі словазмянення, несамастойнымі словамі і прымыканнем. Значная агульнасць слоўніка Б. м. тлумачыцца іх прыналежнасцю да адной групы індаеўрап. дыялектаў, умовамі гістар. і сучаснага развіцця. Фанет., грамат. і лексічныя асаблівасці блізкія да слав. моў, што дае падставы меркаваць пра існаванне перыяду балта-слав. моўнай супольнасці.

З'яўленне пісьменнасці звязана з эпохай Рэфармацыі (16 ст.), калі на прускую, літоўскую і латышскую мовы пачалі перакладаць помнікі рэліг. зместу. Літаратурныя мовы ў іх цяперашнім выглядзе аформіліся ў пач. 20 ст. Пісьмо гукавое, алфавіт на лац. аснове (з шэрагам дыякрытычных знакаў).

Літ.: Языки народов СССР, т. 1, М., 1966, с. 455—465; Сабалюскас А. Балтийские языки, у кн.: Советское языкознание за 50 лет, М., 1967 (бібліягр.); Frenkelis E. Baltų kalbos, Vilnius, 1969.

БАЛТЫМАР (Baltimore), горад у ЗША, у штаце Мэрыленд, на беразе Чэсапікскага заліва Атлантычнага ак. Вял. порт (грузаабарот больш за 25 млн. *т* за год). Пач. пункт першай у ЗША чыгункі Б.—Агайо (1830). Вузел чыгунак і шашэйных дарог. Аэрапорт. 909 тыс. ж. (1968). Гал. галіны прамысл.— чорная і каляровая металургія. Сталеліцейны з-д (10 млн. *т* за год) — вытворчасць трубаў, ліставога пракату, нержавейнай сталі. Развіты маш.-буд., хімічная, нафтаперапр. прамысл. Судна-, ракета- і авіябудаванне. Вытворчасць кабелю, электроннага і транспартнага абсталявання, харч. прадуктаў. 2 ун-ты, карцінная галерэя, музеі. Засн. Б. у 1682.

БАЛУЕЎ Пётр Сямёнавіч (21.6.1857, Стаўрапольская губ.— 1923), рускі ваенны дзеяч, ген., рэакцыянер. У 1-ю сусв. вайну галоўнакамандуючы Паўд.-Зах. фронту, з 4.8.1917 галоўнакамандуючы Зах. фронту. Выступаў супраць дэмакратызацыі арміі, падтрымліваў контррэвалюц. мерапрыемствы Карнілава і Керанскага. Па загадах Б. ў Мінску забаранялася бальшавіцкія газ. «Звезда», «Молот», «Буревестник». Пасля Кастр. рэв. адмовіўся падпарадкавацца Сав. уладзе і 11.11.1917 загадам ВРК Зах. фронту зняты з пасады галоўнакамандуючага.

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 1—2, Мн., 1957; Гапоненко Л. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов, М., 1953.

БАЛХАШ, бяссцёкавае возера на ПдУ Казахскай ССР. 342 *м* над узр. м. Пл. 19,3 тыс. *км*². Даўж. 605 *км*, найбольшая шыр. 74 *км*, найбольшая глыб. 26,5 *м*. У Б. упадаюць з Пд рэкі Ілі, Каратал, Аксу, Лепсы, з Пн — Аягуз. Вузкім пралівам воз. падзяляецца на зах. частку — слабасаленаватую (1‰), шырокую, з моцна парэзанай берагавой лініяй, і ўсх.— саленаватую (5‰) вузкую, берагавая лінія менш звілістая. Зах. і паўн. берагі высокія і скалістыя. Паўд. ўзбярэжжа — плоская раўніна з зараснікамі трыснягу. Т-ра вады ў ліп. да 29 °С. Ледастаў з лістапада да красавіка. Прамысл. рыбы: сазан, судак, марынка, акунь. Шмат вадаплаўных птушак. Суднаходства. На паўн. беразе г. Балхаш.

БАЛЦІН Аўгуст Янавіч [сапр. Блюм Тэадор Янавіч, 5(17).1.1894, г. Газенпот Курляндскай губ.— 23.6.1953], прафесіянальны рэвалюцыянер, дзяржаўны дзеяч БССР. Чл. КПСС з 1909. У рэвалюц. дзейнасць уключыўся ў 1908, вёў парт. прапаганду ў Лібаве, Пецярбурзе, Рызе, Харкаве, Баку, Грозным. Няраз арыштаваны, сядзеў у турмах, высланы пад нагляд паліцыі (1909, 1913, 1914, 1916). Пасля Кастр. рэвалюцыі старшыня Закаўказскага каап. саюза, нам. старшыні Цэнтрасаюза, старшыня Міжкааператыўнага савета і інш. З 1929 у БССР: старшыня Белкаапсаюза, нарком гандлю (1930), нарком забеспячэння (1931—33), нам. старшыні СНК БССР (1933—34), нарком лёгкай прамысл. (1934), нарком мясцовай прамысл. (1934—37). Чл. ЦВК СССР (1935—37), ЦВК БССР (1929—37), Прэзідыума ЦВК БССР (1935—37), ЦК КП(б)Б (1930—37), старшыня т-ва старых бальшавікоў у БССР (1933—37). Узнаг. ордэнам Леніна (1936).



М. І. Каміскі. Мінск.

БАЛЫКОЎ Пётр Антонавіч [н. 6(19).8.1900, в. Нісімкавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. У 1918 добраахвотнікам пайшоў у Чырв. Армію. У пач. Айч. вайны пакінуты ў тыле ворага для падпольнай барацьбы. З жн. 1941 камандзір партыз. атрада імя Калініна, з сак. 1943 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Гомельскай*. З вер. 1943 у Беларускім штабе партыз. руху. З 1944 на гасп. рабоце. На XIX з'ездзе КП(б)Б (1949) выбраны канд. у чл. ЦК. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Чачэрску Гомельскай вобл.

БАЛЬЗАК (Balzac) Анарэ дэ (20.5.1799, Тур — 18.8.1850), французскі пісьменнік, выдатны прадстаўнік крытычнага рэалізму. З сям'і чыноўніка. Выхоўваўся ў пансіёне Лего (г. Тур) і Вандомскім калежы. З 1814 вучыўся ў школе права ў Парыжы і адначасова слухаў лекцыі па л-ры ў Сарбоне. Займаўся адвакацкай практыкай. У 1821—25 выдаў пад рознымі псеўд. 8 раманаў («Наследніца Бірагскага замка», «Клацільда Лузіньянская» і інш.). Гэтыя творы не прынеслі ні славы, ні багацця, якое, на думку Б., магло забяспечыць яму незалежнасць у бурж. грамадстве. Першы твор, які быў падпісаны ўласным імем Б. і прынёс яму літ. вядомасць,— гістар. раман «Шуаны» (1829) пра задушэнне контррэвалюц. мяцяжу ў Брэтані ў 1799. У пач. 30-х г. у Б. ўзнікла думка аб'яднаць свае творы ў цыкл «Чалавечая камедыя», накшталт «Боскай камедыі» Дантэ. Толькі боскаму, незямному Б. проціпаставіў зямное, чалавечае, кругам дантавага пекла — кругі сац. жыцця тагачаснай бурж. Францыі. Ажыццяўленне такога вялізнага плана патрабавала тытанічнай працы. З 143 задуманых рамапаў Б. напісаў 97. «Чалавечая камедыя» складаецца з 3 раздзелаў, ці «эцюдаў». «Эцюды звычаяў» распадаюцца на сцэны прыватнага («Габсек», 1830; «Трыццацігадовая жанчына», 1831—34; «Бацька Гарыо», 1834—35; і інш.), правінцыяльнага («Яўгенія Грандэ», 1833; «Страчаныя ілюзіі», 1837—43; і інш.), парыжскага («Банкірскі дом Нусінген», 1838; «Бляск і ўбоства куртызанак», 1838—47; і інш.), палітычнага («Цёмная справа», 1841; і інш.), ваеннага («Шуаны», 1829; і інш.) і сельскага жыцця («Сяляне», 1844; і інш.). У «Філасофскія эцюды» ўваходзяць «Шчыгрынавая шкура» (1831), «У пошуках абсалюту» (1834) і «Луі Ламбер» (1833); у «Аналітычныя эцюды» — «Фізіялогія шлюбу» (1829) і «Нягоды сямейнага жыцця» (1845—46). У эпапеі раскрыты істотныя рысы цэлага гістар. перыяду ў жыцці Францыі, паказаны працэс разлажэння арыстакратыі і ўсталявання буржуазіі. Яркія вобразы дзялкоў, фінансістаў, ліхвяроў, спекулянтаў увасабляюць усемагутную ўладу золата, сінтэзуюць самыя драпежныя рысы бурж. грамадства (Габсек, Грандэ, Нусінген і інш.). Хоць Б. быў манархістам па сваіх паліт. поглядах, але прызнаваў прагрэс. ролю бурж. рэвалюцыі і высокія маральныя якасці сучасных яму рэвалюцыянераў, «людзей будучыні», падобных на «высакароднага плебея» Мішэля Крэцьена («Страчаныя ілюзіі», «Тайны княгіні дэ Кадзіньян») і «паэта рэвалюцыі» Нізрона («Сяляне»). Літ. спадчына Б. ўключае і тэарэт. працы (прадмова да «Чалавечай камедыі», «Эцюд пра Бейля» і інш.). Творчасць пісьменніка-рэаліста высока ацэньвалі К. Маркс і Ф. Энгельс. Уважлівых і прынцыповых крытыкаў творчасць Б. знайшла ў Расіі ў асобе А. Пушкіна, В. Бялінскага, М. Чарнышэўскага, М. Дабралюбава, М. Горкага. У процілегласць спробам рэакц. бурж. вучоных прынізіць, сфальсіфікаваць сац. значэнне твораў Б. марксісцкае літ.-знаўства падкрэслівае ў яго творчасці глыбіню маст. абагульнення, сілу і вастрыню сац. крытыкі, суровае і бязлітаснае асуджэнне бурж. рэчаіснасці, настойлівую барацьбу за рэалізм.



Тв.: Бел. пер.— Габсек, Мн., 1937; рус. пер.— Собр. соч., т. 1—24, М., 1960.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967; Реизов Б. Бальзак, Л., 1960; Обломиевский Д. Бальзак, М., 1961; Вюрмсер А. Бесчеловечная комедия, пер. с франц., М., 1967; Моруа А. Прометей, или Жизнь Бальзака, пер. с франц., М., 1967.

Б. П. Міцкевіч. Мінск.

БАЛЬЗАМІН (Impatiens), род адна- і шматгадовых (у тропіках) травяністых раслін сямейства бальзамінавых. Сцябло сакаўное, вузлаватае, выш. 20—200 *см*. Лісце прадаўгавата-авальнае, буйназубчастае. Кветкі павіслыя, са шпоркаю, ружовыя, ярка-жоўтыя з чырвонымі плямкамі. Плод — каробачка, якая ад дотыку трэскаецца і з сілай выкідае насенне. Вядома каля 750 відаў, пашыраных пераважна ў трапічных і субтрапічных абласцях Азіі і Афрыкі. У СССР 11 відаў, у БССР 3. Найбольш вядомы Б. звычайны (I. nolitangere, нар. назвы: пстрыкаўка, прыгаўка, бельсаміна лесавая). Расце на топкіх цяністых мясцінах. Настой травы ўжываецца ў нар. медыцыне. Многія віды (Б. бальзамінавы, Б. Ройля і інш.) вырошчваюць як дэкаратыўныя. *Г. А. Кім.* Мінск.



Бальзамін звычайны.

БАЛЬЗАМЫ (грэч. balsamon араматычная смала), натуральныя арганічныя сумесі бязазоцістых рэчываў, пераважна смолаў і эфірных алеяў. Многія Б. ўтвараюцца ў раслінах як прадукты нармальнага абмену рэчываў і выдзяляюцца самі або пры пашкоджанні кары, некаторыя ўтвараюцца і выдзяляюцца толькі як паталагічныя прадукты пры раненнях раслін.

Б. ёсць у трапічных раслінах (Б. мекскі, капайскі, перуанскі) і раслінах сярэдніх і паўн. шырот (Б. сасновы, або жывіца, піхтавы, кедравы, канадскі і інш.) у адмысловых міжклетніках кары, радзей драўніны і лістоў. Б.— сіропападобныя вадкасці, у паветры гусцеюць і цвярдзеюць, маюць прыемны пах, горкія на смак, у вадзе не растваряюцца; растваряюцца ў спірце, ацэтоне, шкіпінары і інш. арганічных растваральніках. У арганізме чалавека і жывёл часткова акісляюцца. Выкарыстоўваюцца ў медыцыне (антысептык і сродак ад глістоў), тэхніцы (на выраб лакаў і інш.), парфумерыі. *І. І. Бардышаў.* Мінск.

БАЛЬНІЦА, установа для стацыянарнага лячэння хворых. У СССР — дзяржаўная лячэбна-прафілактычная ўстанова, якая забяспечвае насельніцтва бясплатнай кваліфікаванай і спецыялізаванай мед. дапамогай. На тэр. Беларусі першыя Б. (шпіталі) узніклі ў канцы 15 — пач. 16 ст. У пач. 19 ст. ў губернскіх і павятовых гарадах Беларусі арганізоўваліся Б. прыказаў грамадскай апекі (Мінск — 1799, Магілёў — 1802, Гродна і Віцебск — 1804 і г. д.), невялікія турэмныя, фабрычныя, прыватныя, філантрапічныя Б.

Шмат Б. пабудавана і рэканструявана за гады Сав. улады. На 1.1.1969 у БССР было 1050 бальнічных устаноў на 87 660 ложкаў (98,5 ложка на 10 тыс. нас.). Большасць Б. з 1947 года аб'яднана з паліклінікамі. Паводле аб'ёму і месца дзейнасці яны бываюць: рэсп., гарадскія, міжраённыя, раённыя і сельскія ўчастковыя. Акрамя агульных, існуюць спецыялізаваныя: дзіцячыя, інфекцыйныя, туберкулёзныя, псіхіятрычныя, шпіталі для інвалідаў Айч. вайны. Б., якія з'яўляюцца навуч. базамі ВНУ, наз. клінічнымі.

Асн. структурная частка Б.— спецыялізаванае аддзяленне (тэрапеўтычнае, хірургічнае, радзільнае і інш.). У структуры Б. прадугледжаны: а) прыёмнае аддзяленне, якое ажыццяўляе прыём, рэгістрацыю, санітарную апрацоўку, выпіску хворых, забяспечвае неадкладную мед. дапамогу і выдае даведкі пра стан хворых; б) дапаможныя лячэбныя і дыягнастычныя аддзяленні — рэнтгенаўскае, фізіятэрапеўтычны кабінет ці аддзяленне, лабараторыя, аптэка і прэзектура, адм.-гасп. частка (пральня, склады, дэзінфекцыйная камера, кухня і інш.).

Б. падпарадкоўваюцца аддзелам аховы здароўя выканкомаў Саветаў дэп. працоўных. Гл. таксама *Ахова здароўя, Амбулаторыя, Паліклініка, Шпіталь.*

Літ.: Фрейдлин С. Я. Организация работы стационара городской больницы, Л., 1960; Бяляцкі Д. П. і Кручок Г. Р. Ахова здароўя ў Беларускай ССР, Мн., 1958; Савченко Н. Е. Здравоохранение Белоруссии за 50 лет, «Советское здравоохранение», 1967, № 11.

Дз. П. Бяляцкі. Мінск.

БАЛЬНІЧНЫЯ КАСЫ, органы страхавання ў капіталістычных краінах, якія выплачваюць дапамогу хворым за кошт страхавых узносаў рабочых. Выплата робіцца толькі з 3—5-га дня непрацаздольнасці. На прадпрыемствах дарэвалюц. Беларусі ўзносы складалі 2—4% зарплаты. Са сродкаў Б. к. прадугледжвалася выдача хворым дапамогі памерам 25—50% сярэдняга заработку на працягу не больш як 26 тыдняў.

БАЛЬЦЕНІКІ, вёска ў Беняконскім с/с Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Гагарына. За 15 *км* на ПнУ ад Воранава, 148 *км* ад Гродна. 147 ж., гасп. 46 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.


БАЛЬШАВІЗМ, рэвалюцыйная марксісцкая плынь палітычнай думкі ў міжнародным пралетарскім руху, якая атрымала сваё ўвасабленне ў партыі бальшавікоў, створанай У. І. Леніным. «Бальшавізм існуе, як плынь палітычнай мыслі і як палітычная партыя, з 1903 года» (Ленін У. І. Тв., т. 31, с. 8). Ён узнік і развіўся на базе марксісцкай тэорыі і ўласнай практыкі 15-гадовай рэвалюц. барацьбы (1903—17). Б. выражаецца сукупнасцю тэарэтычных, ідэалагічных, арганізацыйных і тактычных прынцыпаў, увасобленых у марксісцка-ленінскай партыі як партыі новага тыпу, якая карэнным чынам адрозніваецца ад згодніцкіх партый 2-га Інтэрнацыянала, як партыі сацыяльнай рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыяту, што змагаецца за пабудову камунізма. Б. вызначаецца прынцыповасцю ў пытаннях ідэалогіі і палітыкі, непрымірымасцю да любых ухілаў ад марксізма-ленінізма, высокай дысцыплінай пралетарскай партыі, заснаванай на праверaных на ўласным вопыце стратэгіі і тактыцы, на правільнасці паліт. кіраўніцтва масамі, на свядомасці, адданасці рэвалюцыі, вытрымцы, самаахвяраванні, гераізме членаў партыі, на ўменні партыі «...звязацца, зблізіцца, да пэўнай ступені, калі хочаце, зліцца з самай шырокай масай працоўных, у першую чаргу пралетарскай, але таксама і з непралетарскай працоўнай масай» (Ленін У. І. Тв., т. 31, с. 8).

Сваю назву Б. атрымаў на *Другім з'ездзе РСДРП* (1903), дзе рэвалюц. марксісты-ленінцы на выбарах у кіруючыя цэнтры партыі набралі большасць галасоў, адсюль — бальшавікі; за апартуністычнай часткай з'езду, якая асталася ў меншасці, замацавалася назва меншавікі. Б. абаранiў рэвалюц. змест марксізма, развіў яго далей на аснове міжнар. вопыту класавай барацьбы пралетарыяту ў новых гістар. умовах — у перыяд імперыялізму, калі цэнтр сусветнага рэвалюц. руху перамясціўся ў Расію. Б. вырас і загартаваўся ў барацьбе, перш за ўсё з *апартунізмам.* Апартунізм — «галоўны вораг бальшавізму ўнутры рабочага руху... у міжнародным маштабе» (Ленін У. І. Тв., т. 31, с. 14). Шмат гадоў змагаўся Б. і з дробнабуржуазнай рэвалюцыйнасцю, якая адступае ад патрэб вытрыманай класавай барацьбы пралетарыяту. Гісторыя Б.— гэта гісторыя 3 рускіх рэвалюцый, паспяховага будаўніцтва камуніст. грамадства ў СССР. Б. і камунізм выражаюць адну сутнасць, таму паводле пастановы XIX з'езду партыі (1952) вырашана адмовіцца ад падвойнай назвы партыі (камуністычная — бальшавіцкая) і назваць яе Камуністычная партыя Савецкага Саюза (КПСС). Першая праграма Б. прынята на II з'ездзе партыі (1903), другая — на VIII (1919), трэцяя — на XXII з'ездзе КПСС (1961). Б. узброіў пралетарскія партыі свету тэарэтычнымі, праграмнымі і тактычнымі асновамі. У. І. Ленін адзначаў, што «...масам пралетарыяў усіх краін з кожным днём становіцца яснейшы, што бальшавізм указаў правільны шлях да выратавання ад жудасцей вайны і імперыялізму, што бальшавізм прыгодны як узор тактыкі для ўсіх» (Тв., т. 28, с. 271—272). Сусветна-гістарычны вопыт Б. з'яўляецца найкаштоўнейшым здабыткам рэвалюц. марксістаў, усіх камуніст. і рабочых партый у барацьбе за сацыялізм. Гісторыю развіцця, дзейнасці і здзяйснення прынцыпаў Б. гл. ў артыкулах *Ленін У. І., Марксізм-ленінізм, Камуністычная партыя Савецкага Саюза, Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік* (раздзел «Камуністычная партыя Савецкага Саюза»).

Літ.: Гл. пры арт. *Марксізм-ленінізм, Камуністычная партыя Савецкага Саюза.*

І. М. Ігнаценка. Мінск.

БАЛЬШАВІК, рабочы пасёлак у Гомельскім р-не Гомельскай вобл. Утвораны ў 1950. За 22 *км* на ПнЗ ад Гомеля, 8 *км* ад чыг. ст. Касцюкоўка (на лініі Жлобін — Гомель), на шашы Магілёў — Гомель. 2,5 тыс. ж. (1969). Торфапрадпрыемства «Бальшавік», камбінат быт. абслугоўвання, мех. майстэрня. Сярэдняя і васьмігадовая школы, клуб з б-кай, дзіцячы сад-яслі, бальніца, паліклініка.



Бальніца ў рабочым пасёлку Бальшавік.

БАЛЬШАВІК, вёска ў Папярнянскім с/с Мінскага р-на. Цэнтр саўгаса «Бальшавік». За 10 *км* на ПнЗ ад Мінска. 1010 ж., гасп. 257 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Недалёка ад Б. будуецца (1970) птушкафабрыка. Сярэд. школа, дзіцячы сад, яслі, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, адда. сувязі, сталовая, магазін. Б. узнік у сав. час у выніку ссялення хутароў. У Вял. Айч. вайну ў Б. дзейнічала падпольная група В. П. Гарнашэвіча, якая актыўна змагалася супраць нямец. захопнікаў і мела сувязь з партыз. атрадам «За Айчыну». Фашысты расстралялі больш за 40 жыхароў вёскі.

«БАЛЬШАВІК», тэарэтычны і палітычны орган ЦК КПЗБ (№ 1—40 газета на 12 с., з № 41 часопіс на 50—70 с.). «Б.» выдаваўся нелегальна са снеж. 1924 да 1936 на бел. мове (пекат. матэрыялы ў першых нумарах друкаваліся на рус. мове). Выходзіў нерэгулярна; тыраж 15—17 тыс. у 1927—30, 3—5 тыс. у 1931—36. Выдадзена каля 50 нумароў. Спачатку «Б.» друкаваўся ў Вільні, пазней за межамі Польшчы. Асвятляў пытанні тэорыі і практыкі рэвалюц. барацьбы, дзейнасць секцый Камінтэрна, рэвалюц. рух у Зах. Беларусі. У «Б.» змяшчаліся артыкулы кіраўнікоў КПП і КПЗБ, матэрыялы пра жыццё працоўных СССР, асабліва БССР. Ён адыграў значную ролю ў разгортванні нац.-вызв. барацьбы. У склад цэнтр. рэдакцыі ЦК КПЗБ у розны час уваходзілі А. А. *Альшэўскі* (псеўд. Ю. Пружанскі), М. А. *Блінчыкаў*, С. І. *Будзінскі* і інш. Рэдактарам амаль нязменна быў Л. І. Родзевіч (А. Сталевіч). У канцы 1924—25 пад гэтай назвай выходзіла ляшч. газ. ілжэ-«Б.», якую выдавала антыпартыйная нацыяналіст. група ў КПЗБ — т. зв. *«сэцэсія»* (адшчапенцы). Яна выпусціла 15 нумароў ілжэ-«Б.» (2-гі—16-ы ўключна).

Літ.: Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР, т. 1 (1921—1929), Мн., 1962, с. 587—588; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939), Мн., 1966; Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967, с. 237—267.

А. І. Марозава. Мінск.

«БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ», тэарэтычны і палітычны часопіс, орган ЦК КП(б)Б. Выдаваўся ў Мінску ў 1927—41, 1945—52. З № 11 1952 наз. «Камуніст Беларусі». Гл. *«Коммунист Белоруссии».*

БАЛЬШАВІКІ, гл. *Бальшавізм, Камуністычная партыя Савецкага Саюза, Марксізм-ленінізм.*

БАЛЬШАВІЦКАЯ ФРАКЦЫЯ 4-й ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ (Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая фракцыя), група бальшавікоў, дэпутатаў 4-й Дзярж. думы: Р. І. *Пятроўскі* (старшыня), А. Я. *Бадаеў*, М. К. Муранаў, М. Р. Шагаў, Ф. М. Самойлаў, Р. В. Маліноўскі (правакатар, у 1914 выбыў з Думы). Аформілася 27.10.1913 (дагэтуль бальшавікі былі ў агульнай з меншавікамі с.-д. фракцыі). Прадстаўляла больш як 1 млн. рабочых Расіі. Была легальным парт. цэнтрам, праз які бальшавікі вялі рэвалюц. работу. Дзейнічала пад кіраўніцтвам ЦК РСДРП і асабіста У. І. Леніна. Сацыял-дэмакраты і рабочыя Магілёва, Віцебска, Рэчыцы, Пінска, Смаргоні і інш. гарадоў Беларусі падтрымлівалі з дэпутатамі-бальшавікамі пастаянную сувязь. Рабочыя Мінска, Гомеля, Дзвінска ў наказах заклікалі іх змагацца з ліквідатарамі, абараняць інтарэсы працоўных Беларусі. 16.3.1913 прафсаюз друкароў Гомеля праз рэдакцыю «Правды» накіраваў фракцыі пісьмо, у якім, каб выкрыць царызм перад шырокімі масамі, прапанаваў паставіць на абмеркаванне Думы праекты законаў пра новае, дэмакр. выбарчае права, свабоду саюзаў, сходаў, забастовак, друку, пра 8-гадзінны рабочы дзень. Рабочыя дрэваапрацоўчых прадпр. Мінска прасілі выступіць з законапраектам пра ліквідацыю звышурочных работ. Даведаўшыся пра арышт сакратара фракцыі, рабочыя Смаргоні напісалі пратэст. У гарадах Беларусі распаўсюджвалася «Пісьмо дэпутатаў фракцыі РСДРП да таварышаў рабочых». Члены Б. ф. 4-й Дз. д. арыштаваны 4.11.1914, у лют. 1915 прыгаворaны да ссылкі ў Сібір.

БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК, друк Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, яе ідэйная зброя. Адметныя рысы Б. д.— праўдзівасць, *партыйнасць*, класавасць, непрымірымасць да праяў бурж. *аб'ектывізму, рэвізіянізму, апартунізму*, апалітычнасці. Прайшоў шлях ад рабочых лістовак, пракламацый, брашур, нелегальных газет да масавага, шматнацыянальнага друку СССР.

У 1895 пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа» рыхтаваў выданне газ. «Рабочее дело», але ў свет яна не выйшла (першы нумар канфіскавала паліцыя). З 1896 да 1899 у Жэневе рус. сацыял-дэмакраты выдавалі неперыядычныя зб. «Работник» і «Листок работника». Першая агульнарус. паліт. марксісцкая газета — *«Искра»* [выходзіла нелегальна з 11(24).12.1900; з жн. 1903 кіруючы орган партыі]. Пераемніца яе газ. «Вперед» [выходзіла з 22.12.1904(4.1.1905) да 5(18).5.1905]. З 14(27).5 да 12(25).11.1905 выдавалася газ. «Пролетарий», цэнтр. орган РСДРП. З 27.10(9.11) да 3(16).12.1905 у Пецярбурзе выходзіла першая легальная бальшавіцкая газ. «Новая жизнь»; у 1906 выдаваліся газ. «Партийные известия», «Волна», «Эхо», штотыднёвік «Вестник жизни»; з 21.8(3.9).1906 да 28.11(11.12).1909 — нелегальная газ. «Пролетарий», орган Маскоўскага і Пецярбургскага к-таў РСДРП. З лют. 1908 да студз. 1917 цэнтр. органам РСДРП была нелегальная газ. «Социал-демократ». З 16(29).12.1910 да 22.4(5.5).1912 выходзіла легальная бальшавіцкая газ. «Звезда», з 30.10(12.11).1910 да 30.7(12.8).1912 у Парыжы — «Рабочая газета», якая са студз. 1912 была органам ЦК РСДРП(б). У Пецярбурзе са снеж. 1911 да чэрв. 1914 выдаваўся штомесячны грамадска-паліт. і літ. час. «Просвещение».

22.4(5.5).1912 выйшаў першы нумар масавай марксісцкай газ. «Правда», гісторыя якой непарыўна звязана з гісторыяй КПСС. Усе бальшавіцкія выданні ствараліся па ініцыятыве і пры актыўным удзеле У. І. Леніна. Газ. «Искра», «Вперед», «Пролетарий», «Новая жизнь», «Социал-демократ», «Правда» і інш. шырока распаўсюджваліся на Беларусі, друкавалі матэрыялы з бел. губерняў. У 1904—05 групамі РСДРП ствараліся падпольныя друкарні ў Мінску, Гомелі, Гродне, Баб-



руйску, Магілёве і інш. гарадах Беларусі, у якіх наладжваецца спачатку выпуск бальшавіцкіх пракламацый, лістовак, адозваў, а потым і перыяд. выданняў (гл. *Падпольныя друкарні РСДРП*). У 1904—06 выдаваліся бальшавіцкія перыядычныя выданні: *«Полесский листок»*, *«Летучий листок Полесского комитета»*, *«Листок Северо-Западного Союза»*, *«Минский летучий листок»*; «Летучий листок» Гомельскага раённага к-та РСДРП; салдацкія бальшавіцкія газ.: *«Солдатская воля»* (орган Гродзенскай с.-д. ваен. арг-цыі), *«Солдатская жизнь»* (орган ваен.-рэвалюц. арг-цый Паўн.-Зах. саюза РСДРП) і інш. Пасля Лют. рэв. 1917 разгарнулі выдавецкую справу многія бальшавіцкія арг-цыі краіны. У Мінску з 27.7(9.8).1917 пачала выходзіць першая на Беларусі легальная масавая бальшавіцкая газ. «Звезда», якая з-за праследаванняў з боку бурж. Часовага ўрада выдавалася таксама пад назвамі «Молот», «Буревестник» (гл. *«Звязда»*).

Пасля Кастр. рэвалюцыі выходзяць цэнтр. газ. «Беднота», «Экономическая жизнь», «Жизнь национальностей», ствараецца парт. і сав. друк у сав. рэспубліках. На Беларусі ў 1917—18 сталі выходзіць газ. *«Советская правда»* (орган выканкома Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Зах. вобл. і фронту), «Известия Военно-революционного комитета города Витебска» (гл. *«Віцебскі рабочы»*), «Известия Могилевского Совета, рабочих и солдатских депутатов» (гл. *«Магілёўская праўда»*), «Известия Гомельского Совета солдатских и крестьянских депутатов» (гл. *«Гомельская праўда»*), *«Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов»*, *«Известия Климовичского исполкома Совета крестьянских и красноармейских депутатов»* і інш. Ствараюцца армейскія газеты. 12(25).11.1917 у Маладзечне пачала выдавацца штодзённая газ. *«Бюллетень Военно-революционного комитета X Армии»*; 26.11(9.12).1917 у Магілёве — газ. *«Революционная ставка»*, орган Ваенна-рэвалюц. к-та пры Стаўцы, з № 19 ад 19.1.1918 орган Цэнтр. к-та дзейных армій і флотаў; першая бальшавіцкая газета ў Магілёве. 3.11(16.11).1917 у Нясвіжы — газ. «Бюллетень Военно-революционного комитета II Армии». 21.11(4.12).1917 у Полацку — газ. *«Известия Военно-революционного комитета III Армии»* і інш. выданні. У сувязі з акупацыяй часткі тэр. Беларусі ням. інтэрвентамі рэдакцыя газ. «Звезда» ў лют. 1918 эвакуіравалася ў Смаленск. Там з кастр. 1918 пачала выходзіць штодзённая сялянская газ. *«Бедняк»*, а ў час польскай інтэрвенцыі з 1.2.1920 — газ. *«Савецкая Беларусь»*. Газ. «Звезда», «Бедняк», «Савецкая Беларусь» засыпаліся ў акупаваныя раёны Беларусі. У 1918—19 у Мас-

кве выдавалася першая сав. газ. на бел. мове *«Дзянніца»*. З 12.10.1918 у акупаваным ням. інтэрвентамі Мінску выдаецца газ. *«Подпольная правда»* (орган Краявога к-та Камуніст. арг-цый Літвы і Беларусі). Падпольныя друкарні былі ў Гродне, Мазыры, Гомелі, Рэчыцы і інш. гарадах. Газеты *«Набат»* (Гродна, 1918), *«Минский пролетарий»* (выдавалася ў Мінску з 1.4.1919), «Соха и молот» (Магілёў, 1919—24) і інш. заклікалі працоўных на барацьбу з інтэрвентамі. 17.5.1920 выйшаў першы нумар газ. *«Белорусская правда»* (орган партызанаў-камуністаў).

У 20-я г. ў СССР (у т. л. і ў БССР) ствараюцца газеты і часопісы з разлікам на пэўныя колы масавага чытача — для рабочых, прафсаюзных, с.-г., для моладзі, ваен., літ. і інш.: «Гудок» (1920), «Рабочая газета» (1922—32, з № 1 да 98 называлася «Рабочий»), «Крестьянская газета» (1923—39), «Учительская газета» (з 1924), «Красная звезда» (з 1924), «Комсомольская правда» (з 1925), час. «Большевик» (з 1924) і інш.; на Беларусі — час. «Бальшавік Беларусі» (з 1927, гл. *«Коммунист Белоруссии»*), «Сацыялістычнае будаўніцтва» (1924—37), газ. *«Беларуская вёска»* (1921—31), *«Чырвоная змена»* (з 1921), час. *«Полымя»*, *«Маладняк»* і інш. Пашыраецца рабселькораўскі рух. У 30-я г. ў СССР (у т. л. і ў БССР) ствараецца сетка раённых газет. У 1933 у рэспубліцы выдавалася 201 газ. (гадавы тыраж 113,5 млн. экз.); у 1934 выходзіла каля 100 газ. палітадзелаў МТС і саўгасаў. Для падрыхтоўкі кваліфікаваных журналісцкіх кадраў у 1932 у Мінску створаны *Камуністычны інстытут журналістыкі* (КІЖ) імя Кірава. У 1938 на Беларусі выдавалася 8 рэсп., 4 абл., 92 раённыя, 90 фабрычна-заводскіх, каля 15 тыс. насценных газет і 4 часопісы. У Зах. Беларусі да 1939 быў пашыраны падпольны камуніст. друк. Выдаваліся газ. *«Чырвоны сцяг»* (1924—36), газ. (з № 41 час.) *«Бальшавік»* (1924—36), *«Бюлетэнь ЦК КПЗБ»* (1927—36), газ. *«Малады камуніст»* (з ліст. 1924) і інш. Гл. *Падпольны перыядычны друк КПЗБ*.

З вер. 1939 ствараецца сетка газет у вызваленых з-пад улады бурж. Польшчы абласцях і раёнах Зах. Беларусі. У сак. 1941 у БССР выходзіла 181 друкаваная газ., сярод іх газ. зах. абласцей рэспублікі: «Рабочы» (Брэст), «Палеская праўда» (Пінск), «Чырвоны сцяг» (Маладзечна) і інш. У гады Вял. Айчыннай вайны на тэрыторыі рэспублікі выдаваліся 162 падпольныя і партызанскія газеты (гл. *Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі*). У акупаваныя раёны рэспублікі засыпаліся газеты *«Савецкая Беларусь»*, *«За Савецкую Беларусь»*, *«За свабодную Беларусь»*, «Віцебскі рабочы», якія выдаваліся ў прыфрантавой палосе, перыяд. выданні *«Раздавім фашысцкую гадзіну»*, *«Партызанская дубінка»*, «Блокнот агитатора-партызана», цэнтр. газеты «Правда», «Известия», «Комсомольская правда», «Красная звезда». У 1969 — 180 газ., 83 час. і інш. перыяд. выданняў разавым тыражом больш за 5 млн. экз. На Беларусі распаўсюджваецца больш за 10 млн. экз. саюзных, рэсп. і інш. газет і часопісаў. Гл. таксама *Друк, Газета, Часопіс*.

Літ.: Большевистская печать (Сб. материалов), в. 1—4, М., 1959—1961; О партийной и советской печати. Сб. документов, М., 1954; Из истории партийно-советской печати Белоруссии. Сб. ст., Мн., 1960; Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967; Друк Беларускай ССР. 1918—1965. Мн., 1967. *Р. В. Булацкі*. Мінск.

«БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК», двухтыднёвы часопіс ЦК КП(б)Б; выдаваўся ў Мінску ў 1933—36 на бел. мове. Быў разлічаны на супрацоўнікаў раённых, гарадскіх, палітаддзельскіх, фабрычна-заводскіх газет і рабселькораў. Асн. змест: агляды друку, артыкулы па пытаннях парт. кіраўніцтва друкам, пра формы масавай работы газет. Пастаянныя рубрыкі: «Трыбуна вопыту», «Наша кансультацыя», «Вучоба рэдактара», аддзел сатыры і інш. Выйшла 50 нумароў. Рэдагаваў часопіс А. П. *Джалюк*.

М. С. Зярніцкі. Мінск.

БАЛЬШАКОЎ Барыс Аляксеевіч [13(26).9.1910, Архангельск — 27.8.1950], беларускі спартсмен, заслужаны майстар спорту (1947). Чэмпіён СССР па канькабежным (1941, 1948) і веласіпедным спорце (спрынтэрскае многабор'е, 1949). З 1933 неаднаразовы чэмпіён БССР па канькабежным спорце. Быў першы на 500-метровай дыстанцыі ў міжнар. сустрэчы (Масква, 1936) з нарвежскімі скараходамі. Чэмпіён 1-й бел. многадзённай шашэйнай велагонкі на 1200 *км* (1937). Па яго ініцыятыве штогод праводзілася аднадзённая веласіпедная гонка па маршруце Мінск — Барысаў — Мінск, якая з 1950 носіць назву гонкі на прыз імя Б. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны» (1933), медалямі.

Літ.: Багушэвіч Ю. і Садоўскі Я. Чэмпіёны краіны, Мн., 1953.



БАЛЮНОВА Праскоўя Васілеўна [н. 17(30).10.1910, в. Крупец Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1959. З 1932 калгасніца калгаса «Шлях сацыялізма», з 1943 даярка калгаса «Беларусь» Добрушскага р-на Гомельскай вобл.

БАЛЯСЛАЎ I Храбры (Bolesław I Chrobry; 967—17.6.1025), польскі князь [992—1025], кароль у 1025. Сын князя *Мешка I*. У барацьбе з т. зв. «Свяшчэннай Рымскай імперыяй» Б. I закончыў аб'яднанне польскіх зямель. У 1018 зрабіў паход на Кіеў і памог свайму зяцю Святаполку заняць трон, захапіў Чэрвенскія гарады (правабярэжжа Буга на Пд ад сучаснага г. Хэлм), якія ў 1031 адваяваў Яраслаў Мудры.

БАЛЯСЛАЎ III Крывавусты (Bolesław III Krzywousty; 20.8.1085—28.10.1138), польскі князь [1102—38]. Атрымаў у спадчыну Сілезію і Малую Польшчу. Перамог у

барацьбе старэйшага брата Збігнева, які ўладаў Мазовіяй і Вялікай Польшчай, і дабіўся часовага аднаўлення паліт. адзінства Польшчы. Далучыў Усходняе (1116) і Заходняе (1123) Памор'е. У 1138 краіну падзяліў паміж сынамі на ўдзелы, што было пачаткам вял. перыяду феад. раздробленасці Польшчы.

БАЛЯСЛАЎСКІ Ісак Яфрэмавіч (н. 9.6.1919, г. Залатаноша Палтаўскай губ.), беларускі шахматыст, міжнародны гросмайстар (1948). Гросмайстар СССР з 1945. Засл. майстар спорту з 1948. Чэмпіён свету (1952) і Еўропы (1957, 1965) у камандным першынстве. Неаднаразовы пераможца чэмпіянатаў УССР, БССР. Удзельнік пяршынстваў СССР з 1940. Паспяхова выступаў у камандных сустрэчах па шахматах СССР — ЗША (1945—46, 1954—55), СССР — Вялікабрытанія (1946—47, 1957). Удзельнік міжнар. матчаў БССР — Польшча, БССР — Венгрыя, БССР — ГДР. З 1954 ст. трэнер зборнай СССР. Вядомы тэарэтык шахматнай гульні. Распрацаваў шэраг сістэм у сіцыліянскай, старажытнаіндыйскай абаронах. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Избранные партии, М., 1957; Caro-Kann bis Sizilianisch. Berlin, 1968; Königsindisch bis Grünfeld-Verteidigung, Berlin, 1969.

БАМАКА (Bamako), сталіца Рэспублікі Малі з часу абвяшчэння яе незалежнасці (1960), на беразе Нігера, у месцы збліжэння яго з Сенегалам. Чыг. ст., вузел аўтамаб. дарог, рачны порт, аэрапорт. 175 тыс. ж. (1968). Гал. прадпр.: эл. станцыі, піўзавод, з-д дрэваапрацоўкі і вытворчасці металаканструкцый, мех. майстэрні, запалкавая ф-ка, бойня. Вытв. алею. Развіта рамесніцтва, 2 каледжы. Нац. ін-т мастацтваў. У 1965 пры садзеянні СССР пабудаваны цэнтр прафесіян.-тэхнічнага навучання. НДІ трапічнай афтальмалогіі і праказы.

БАМАРШЭ (Beaumarchais) П'ер Агюстэн Карон дэ (24.1.1732, Парыж — 18.5.1799), французскі драматург. З сям'і майстра гадзіннікаў. У «Мемуарах» (1773—74) выкрываў норавы тагачаснага судаводства, выступіў як мастак-асветнік. Першыя п'есы «Яўгенія» (1767) і «Два сябры» (1770) напісаны ў духу «мяшчанскай драмы». Славу прынеслі камедыі «Севільскі цырульнік, або Марная перасцярога» (1775) і «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігара» (паст. 1784). Створаныя ў перыяд рэвалюц. ўздыму ў Францыі, яны з'явіліся пачаткам сацыяльна-паліт. камедыі ў франц. л-ры. Франц. бурж. рэв. канца 18 ст. сустрэў без энтузіязму. П'еса «Віноватая маці» (паст. 1792) сведчыць пра спад камедыйнага таленту драматурга. На сюжэты камедый Б. напісаны оперы «Севільскі цырульнік» Дж. Расіні (1816) і «Вяселле Фігара» В. А. Моцарта (1786).



Тв.: Бел. пер.— Жаніцьба Фігара, Мн., 1936; рус. пер.— Избр. произведения, т. 1—2, М.,1966.
Літ.: Мокульский С. С. Пьер Бомарше, М., 1957; Финкельштейн Е. Пьер Огюстен Карон Бомарше, Л.— М., 1957.

БАМБАРДА, адна з першых буйнакаліберных агнястрэльных гармат 14—16 ст. Ствалы рабілі з бронзы або жалеза. Стралялі Б. каменнымі ядрамі на адлегласць 400—700 *м*. Калібр да 1000 *мм*, маса 16—19 *т*, скарастрэльнасць — пекалькі стрэлаў за дзень. Лёгкія палявыя Б. пачалі рабіць у 15 ст.

БАМБАРДЗІРОВАЧНАЯ АВІЯЦЫЯ (ракетаносная), род ваеннай авіяцыі, прызначаны для паражэння аб'ектаў праціўніка на полі бою, у аператыўным і стратэгічным тыле. У залежнасці ад характару баявых задач і лётна-тактычных уласцівасцей самалётаў падзяляецца на франтавую і далёкалётную (у ЗША і Вялікабрытаніі — на тактычную і стратэгічную). Мае на ўзбраенні бамбардзіроўшчыкі (ракетаносцы) з дагукавой і звышгукавой скорасцю, значнай грузападымальнасцю і вышыпёй палёту. Можа выкарыстоўваць ракеты, ядзерныя і звычайныя бомбы і за кароткі час нанесці ўдары вялікай разбуральнай сілы. Свае задачы Б. а. выконвае самастойна і ва ўзаемадзеянні з інш. родамі авіяцыі, ракетнымі часцямі і агульнавайсковымі аб'яднаннямі.


БАМБАРДЗІРОЎШЧЫК, баявы самалёт, узброены бомбамі і ракетамі (у т. л. з атамным зарадам). Падзяляюцца на цяжкія (стратэгічныя), сярэднія і лёгкія. Сучасныя Б. маюць 2—8 турбарэактыўных рухавікоў, масу да 180 *т*, скорасць 1000—2000 *км/гадз* і большую, далёкасць лёту да 16 тыс. *км*, грузападымальнасць 9—38 *т*, могуць ляцець на выш. да 20 *км*. У асобны клас бамбардзіровачнай авіяцыі вылучаюць ракетаносцы, ракетапланы і Б., узброеныя самалётамі-снарадамі.

БАМБАСХОВІШЧА, гл. *Калектыўныя сродкі засцярогі*.

БАМБЕЙ, горад у Індыі, буйны эканамічны і культурны цэнтр краіны. Адм. ц. штата Махараштра. Размешчаны каля зах. ўзбярэжжа Індастана на в-ве, злучаным з кантынентам дамбаю. Гал. порт краіны па імпарце (па агульным грузаабароце ўступае Калькуце). У 1965/66 грузаабарот порта склаў каля 8 млн. *т*. Вялікі чыг. вузел і міжнар. аэрапорт. 4902 тыс. ж. (1967).

Першае ўпамінанне пра невялікае сяло Б. адносіцца да 1532, калі яго захапілі партугальцы. У 1661 Б. адышоў да Англіі. Цэнтр рэвалюц. нац.-вызв. руху. Тут адбыліся: стачка 1908 — першае паліт. выступленне інд. пралетарыяту, забастоўкі тэкстыльшчыкаў у 1928—29, узнік першы ў Індыі рэвалюц. прафсаюз «Гірні камгар» («Фабрычны рабочы»). Сусв. вядома антыімперыялісг. дэманстрацыя ваенных маракоў у Б. (1946).

У Б. упершыню ў Індыі ўзнікла нац. прамысловасць. Адзін з найстарэйшых у свеце цэнтраў баваўнянай прамысл. (200 прадпр., больш за ¼ баваўнянай вытв. Індыі). Развіты машынабудаванне (каля 400 прадпр.) і нафтахімія. У Б. 45% прадпрыемстваў тэкст. машынабудавання краіны, з-ды транспартнага і эл. абсталявання, аўтазборачныя прадпр.,



Адна з вуліц гандлёвай часткі Бамбея.

трактарны з-д (з 1965) і інш.; ф-кі гумавых вырабаў і штучнага шоўку, гарбарныя з-ды, прадпр. шкляной і палігр. прамысл. Каля Б. 3 ГЭС, у горадзе вялікая ЦЭС. У прыгарадзе Трамбей 2 атамныя рэактары, з-д для ачысткі урану.

Сярод арх. збудаванняў: уп-т (засн. ў 1857), вакзал Вікторыя, муніцыпалітэт, суд у псеўдакласічным і псеўдагатычным стылі (19 ст.). У псеўданац. стылі — «Вароты Індыі», паштамт, музей прынца Уэльскага (пач. 20 ст.). Культавыя будынкі: цэрквы, мячэці, індускія храмы, 5 «Вежаў Маўчання» для пахавальнага абраду парсаў і храм парсаў. У раёне Малабар Хіл багатыя асабнякі, кінастудыі. Прамысл. раён Парэл са скучнай забудовай і халупамі беднаты. У Б. дэпартамент атамнай энергіі, ін-т фундаментальных даследаванняў. Кінематаграфічны цэнтр.

БАМБУК, назва дрэвападобных злакаў, аб'яднаных у групу (трыбу) бамбукавых (Bambuseaeae). Шматгадовыя, радзей аднагадовыя расліны з падземным карэнішчам і дрывяністым, вузлаватым, пустым усярэдзіне сцяблом (саломінай) да 40 *м* выш. і 30 *см* у дыяметры.



Б. хутка расце, утварае густыя зараснікі і нават лясы. Большасць відаў цвіце адзін раз у жыцці. Вядома 48 родаў і каля 600 відаў, найб. пашыраных у вільготных тропіках і субтропіках абодвух паўшар'яў. У СССР дзіка растуць 6 відаў роду Sasa (у Прыморскім краі, на Курыльскіх а-вах і Сахаліне); віды родаў арундзінарыя, філастахіс культывуюцца на Чарнаморскім узбярэжжы Крыма і Каўказа. Б.— добрая мелліярац. расліна, выкарыстоўваецца на асушэнні балот. Лёгкія і моцныя сцяблы ідуць на буд-ва жыллля, мастоў, на выраб мэблі, посуду, водаправодных трубаў; з валокнаў лісця і сцяблоў плятуць цыноўкі, вырабляюць паперу. Маладыя парасткі ядомыя. З соку сцяблоў некаторых відаў робяць бамбукавы цукар.

БАНАН (Musa), род шматгадовых раслін сямейства бананавых. Лісты вялікія (да 4 *м*), ніжняя частка іх утварае несапраўдны трубчасты ствол выш. 10—15 *м*. Кветкі няправільныя (зігаморфныя), суквецце — звіслы складаны колас. Плады буйныя, трохгранныя, серпападобныя, маюць да 16,2% цукру. Суплоддзе дасягае 50 *кг* (да 300 пладоў). Вядома каля 80 відаў. Радзіма Б.— трапічная Азія, Афрыка, Паўн. Аўстралія. Найбольшае значэнне мае харч. від (М. paradisiaca). Плады яго ўжываюць свежыя і сушаныя, перапрацоўваюць на кансервы, віно і інш. Некат. віды (M. textilis, M. ensete і інш.) выкарыстоўваюцца ў тэкст. прамысловасці (манільская пянька). У СССР на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа вырошчваюць Б. японскі як дэкаратыўную расліну. У БССР Б. можна выкарыстоўваць для ўнутранага азеляненння.

БАНАНАВЫ, беларускі сорт яблыні. Выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы А. Я. Сюбаравым скрыжаваннем рус. сорта *Бабульчын* з амер. сортам Банан зімовы. Плады пляската-круглявыя, саламяна-жоўтыя з румянцам. Мякаць шчыльная, вінна-кіслая. Пладаносіць на 5—6-м годзе, у 14—16 гадоў дае больш за 100 *кг* пладоў з дрэва. Плады ляжаць да мая. Сорт зімастойкі, парша на яго амаль не нападае. Часткова самаплодны, але найлепшыя ўраджаі дае ад апыляльнікаў *Антонаўка звычайная*, *Стойкі*, Пепін палеспшаны.

БАНАПАРТЫ (франц. Bonaparte, ісп. Buonaparte), французская імператарская дынастыя. Засн. Напалеонам I Банапартам (імператар Францыі [1804—14, 1815]).

Асноўныя прадстаўнікі дынастыі — браты Напалеона I — Жазеф, Луі і Жэром — былі пасаджаны на трон у пераможаных Францыяй дзяржавах Еўропы (Іспаніі, Галандыі, Вестфаліі). Вялі палітыку ў інтарэсах буйной буржуазіі. Пасля паражэння арміі Напалеона I пры Ватэрлоо Б. страцілі свае кароны. Але ў 1848 пляменнік Напалеона I Луі Напалеон заняў пасаду прэзідэнта Францыі, а ў снеж. 1852 быў абвешчаны імператарам Напалеонам III. Вераснёўская рэвалюцыя 1870 спыніла яго панаванне.

БАНАПАРТЫЗМ, адна з формаў кіравання буйной контррэвалюцыйнай буржуазіі ва ўмовах пяўстойлівай раўнавагі класавых сіл. «Банапартызм ёсць форма кіравання, якая вырастае з контррэвалюцыйнасці буржуазіі ў абстаноўцы дэмакратычных пераўтварэнняў і дэмакратычнай рэвалюцыі» (Ленін У. І. Тв., т. 25, с. 235—236).

Ва ўмовах, калі контррэвалюцыя не ў сіле справіцца з рэвалюц. рухам, а пралетарыят яшчэ не такі моцны, каб перамагчы, буржуазія вымушана лавіраваць, ісці на пазначныя ўступкі, ствараць уяўленне, што яе ўрад «надкласавы», «надпартыйны». Дэмагагічнымі абяцаннямі яна прыкрывае палітыку агрэсіі і шавінізму, наступленне на дэмакр. сілы. Каб утрымаць уладу, шырока выкарыстоўвае паліцэйска-бюракратычны апарат, армію, царкву. Б. узнік у Францыі ў перыяд дыктатуры Напалеона I; быў адноўлены пасля рэвалюцыі 1848 у выніку дзярж. перавароту (1851) Луі Банапарта. Банапартысцкія метады кіравання характэрны буржуазіі розных краін (банапартызм Бісмарка ў Германіі, Сталыпіна і Керанскага ў Расіі).



Літ.: Маркс К. Восемнадцатое Брюмера Луи Бонапарта, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 8; Ленін У. І. Аб ацэнцы бягучага моманту, Тв., т. 15 (Поли. собр. соч., т. 17); яго ж. Пачатак банапартызму, там жа, т. 25 (Поли. собр. соч., т. 34).

БАНАЎ Іван Мікалаевіч [н. 16(29).8.1916, станіца Тацынская Данскога войска вобл.], адзін з арганізатараў

партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1935. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). На фронце з чэрв. 1941. Са жн. 1942 у тыле ворага. Падрыхтаваў тры групы разведчыкаў, якія рабілі дыверсіі ў паўд. раёнах Баранавіцкай вобл. Са студз. 1944 памагаў польскім партызанам у барацьбе з гітлераўцамі. Пасля вайны скончыў ваен. акадэмію імя Фрунзе. Ген.-м. Б. служыць у Сав. Арміі.

Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 85—97.

БАНАХ (Banach) Стэфан (30.3.1892—31.8.1945), польскі матэматык. Праф. (1924), з 1939 дэкан фіз.-матэм. ф-та Львоўскага ун-та. Адзін са стваральнікаў сучаснага функцыянальнага аналізу. Яго імем названы лінейныя прасторы, у якіх найбольш плённа вывучаюцца лінейныя функцыяналы і аператары. Аўтар працы «Тэорыя лінейных аперацый». Адзін са стваральнікаў львоўскай матэматычнай школы.

Тв.: Дифференциальное и интегральное исчисление, пер. с польск., 2 изд., М., 1966.

БАНАЧЫЧ Антон Пятровіч [19(31).12.1880, Марыупаль — 22.3.1933], рускі спявак (спачатку барытон, потым драматычны тэнар). Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1901). Спяваў у прыватных т-рах Пецярбурга, Кіева, Харкава і інш. У 1908—21 саліст Вялікага т-ра ў Маскве, дзе першы выканаў партыі Садко («Садко» М. Рымскага-Корсакава), Альбера і Паала («Скупы рыцар» і «Франчэска да Рыміні» С. Рахманінава), Галіцына («Хаваншчына» М. Мусаргскага), Дон Жуана («Каменны госць» А. Даргамыжскага). Гастраліраваў па Еўропе і ЗША. З 1921 саліст, рэжысёр і педагог т-раў і муз. тэхнікумаў Омска, Томска, Саратава. З 1928 у Мінску, кіраўнік класаў опернай падрыхтоўкі, сольных спеваў і камернага ансамбля Бел. муз. тэхнікума і Бел. студыі оперы і балета (1930—33), першы загадчык вак. кафедры Бел. кансерваторыі (з 1932). Аўтар аперэты «Востраў нявінпасці» (1909).



І. Г. Нісневіч. Мінск.

БАНГІ (Bangui), сталіца Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікі. Размешчана на Пд краіны ў пач. ніжняга суднаходнага ўчастка р. Убангі. Рачны порт, вузел аўтамаб. дарог. Паблізу міжнар. аэрапорт. 150 тыс. ж. (1966). У Б. і наваколлі — бавоўнаачышчальны, алюмініевых вырабаў, велазборачны, піваварны з-ды, цыгарэтная, абутковая, ткацкая і швейная ф-кі, ЦЭС, пільні, бойня, масларобчыя і мылаварныя прадпр., рамонтныя майстэрні. Геафіз. станцыя.

БАНГКОК (Крунгтэп), сталіца Тайланда. Размешчаны пераважна на левым беразе суднаходнай ракі Менам, за 33 *км* ад яе ўпадзення ў Сіямскі заліў. Чыг. вузел, гал. порт краіны — праз яго праходзіць каля 80% экспарту і 90% імпарту. Аэрапорт. 2,04 млн. ж. (з прыгарадамі, 1968). Сталіца Тайланда з 1782 (паводле інш. звестак з 1769). Цэнтр рабочага і дэмакр. руху краіны. У Б. каля паловы прамысл. прадпр. Тайланда. Гал. галіна прамысл.— ачыстка рысу, ёсць і інш. прадпр. харч., тэкст. і абутковай прамысловасці, суднарамонтныя верфі, некалькі ЦЭС, нафтаачышчальныя, цэментныя, аўта- і трактаразборачныя, невялікія маш.-буд. з-ды, рамонтныя майстэрні. Значная частка прадпр. кантралюецца замежным капіталам. У Б. Цэнтр. банк і шэраг філіялаў амер. і англ. банкаў.

Б. мае рэгулярную планіроўку і адлюстроўвае нац. традыцыі буд. і маст. культуры тайскага народа. Ад ракі Б. умацаваны сценамі. Горад вядомы унікальнымі храмавымі комплексамі — ватамі (Арун, Чэтупон, Раджабапіт, Пра Кео). На ўскраінах — традыцыйныя каркасныя домікі на палях і плывучыя дамы-лодкі (сампаны). Гораду характэрна і сучасная архітэктура з ужываннем жалезабетону і шкла. Тры ун-ты, медыцынскі, сельскагаспадарчы і політэхнічны ін-ты, Нац. б-ка, музей, тэатры.

БАНДА МОРА (Banda), міжастраўное мора на З Ціхага ак., паміж а-вамі Сулавесі, Буру, Серам, Селатан-Тымур, Ветар, Салор. Пл. 695 тыс. *км²*. Найб. глыбіня 7440 *м*. Цячэнні ў лютым накіраваны на ПдУ і У, у жн. на З і ПнЗ. Сярэдняя т-ра вады 27—29 °С. Салёнасць 33,0—34,5‰. Прылівы да 2,4 *м*. Найб. порт Амбон.


БАНДАЖ (франц. bandage павязка), 1) у тэхніцы — металічнае кольца ці пояс, які надзяецца на часткі машын, каб павялічыць іх трываласць ці даўгавечнасць. Б. электрычных машын — стальны пояс з дроту, які трымае абмотку якара. Б. турбін — кольца з фасонай сталі ці дроту на канцы лапатак турбін або на сярэдняй частцы доўгіх лапатак. Б. чыгуначны — стальны вобад, які надзяецца на колы лакаматыва ці вагона. 2) У медыцыне — хірургічная павязка, якою падтрымліваюць сценкі жывата (пры апусканні вантробаў, пры цяжарнасці і грыжы) і засцерагаюць органы ад зруху. Выраблюцца Б. з шчыльных тэкст. матэрыялаў з ужываннем стальных пласцінак, пластмас. 3) У спорце — эластычны пояс, якім сцягваюць ніжнюю частку жывата пры падыманні вял. цяжараў і пры спарт. барацьбе.

БАНДАК Яніна Вікенцьеўна [н. 2(15).10.1909, в. Целяшэвічы Мінскага пав.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1962. З 1936 цялятніца калгаса імя Дзяржынскага Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна.

БАНДАРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ, выраб рознай тары з драўляных клёпак.

Бандарнае рамяство ў мінулым было заснавана на ручной апрацоўцы з дапамогай струга, фуганка, скоблі і інш. інструментаў. Шырока бытавала на Беларусі, а таксама ў губернях Расіі, багатых лесам. Выраблялі бочкі, балеі, кадушкі, *кубы*, *даежкі*, *цабры*, ражкі, *бойкі*, вёдры, даёнкі, бікагі, конаўкі з клёпак, сцягнутых металічнымі або зробленымі з прутоў дубу, вязу, клёну, ясеню абручамі. На Беларусі вядомы дубаны або

точаны посуд з цэлага кавалка дрэва (начоўкі, кадзі-ліпаўкі, міскі, карцы, салонкі, лыжкі). Сыравінай служылі дуб, асіна, бяроза, вольха, клён, груша, яблыня, хвоя. Найб. складаная вытворчасць дубовых бочак пад вадкія прадукты (піва, віно, спірт). У БССР бандарныя вырабы выпускаюць пераважна раённыя прамкамбінаты ў Жло-



1. Кубел. 2. Рэшата. 3. Дзяжа. 4. Даёнка. 5. Бочка для вады і квасу.

біне, Шуміліне, Старобіне, Чэрвені, Крупках, Гродзенскі прамкамбінат у в. Грандзічы, хімкамбінат у Баранавічах, дрэваапрацоўчы камбінат у Косаве і інш. Высушанай клёпцы на клёпкастругальным станку надаюць выпукла-ўвагнутую форму, а на кантафугавальным падразаюць канты. Потым клёпку збіраюць у бочкавы каркас, які апрацоўваюць у парыльнях, каб надаць драўніне гнуткасць. Канчаткова каркас фармуюць у сцяжным прэсе, дзе на другі яго канец насаджваюць 1—2 абручы. Дно бочкі выразаюць з сабранай у шчыты плоскай клёпкі на дновыразальным станку, а паз на каркасе — на ўторным станку. Пасля ўстаноўкі дна ва ўторны паз бочку абціскаюць на абручасаджальных станках. Бываюць таксама і фанерныя бочкі, выраблены выклейваннем клёпкі з некалькіх лістоў шпону. Адпаведную форму клёпцы надаюць алмачасова з клейкай у абагравальных прэсах. Каб не пранікла вільгаць, на бандарныя вырабы наносяць звонку алейныя ці эмалевыя фарбы, а знутры спец. саставы на аснове смалы, клею і інш. Развіццё бляхарства і хім. прамысловасці скарачае асартымент бандарных вырабаў.

Літ.: Потолоков С. И. Технология бондарного производства, 2 изд., М., 1957; Яго Ж. Производство заливных и сухотарных бочек, М., 1962; Ожогин А. И. Производство бочек из древесноволокнистой массы, М., 1966.

БАНДАРОЎНА, гераіня беларускіх і ўкраінскіх песень-балад гістарычнага характару. Песні пра Б. ўзніклі ў 18 ст., былі шырока вядомыя на Беларусі, бытуюць і цяпер. Варыянты іх запісалі П. Шэйн, Е. Раманаў, М. Федароўскі і інш. бел. фалькларысты. На аснове песень-балад пра Б. Янка Купала напісаў паэму «Бандароўна».

БАНДАРЧУК Пётр Фёдаравіч [н. 18.9(1.10).1911, в. Забораўцы Пінскага пав. Мінскай губ.], кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. Да вайны працаваў на с. гасп. На фронце з 1944. Вызначыўся пры захопе Вісленскага плацдарма (узброены ручным кулямётам двое сутак адбіваў контратакі ворага і ўтрымліваў захоплены рубеж да падыходу батальёна); у баях за Познань (Польшча) і пры ліквідацыі познанскай варожай групоўкі аддзяленне, якім камандаваў Б., не дало магчымасці праціўніку вырвацца з акружэння. Жыве ў в. Вулька Лаўская Пінскага р-на Брэсцкай вобл.

БАНДАРЧУК Сяргей Фёдаравіч (н. 25.9.1920, с. Белазёрка Херсонскага пав.), рускі савецкі акцёр і рэжысёр кіно. Нар. арт. СССР (1952). У 1948 скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі (майстэрня С. Герасімава). Стварыў вобразы мужных, поўных унутранай сілы і душэўнай прыгажосці людзей. З роляў: Шаўчэнка [«Тарас Шаўчэнка», Дзярж. прэмія СССР 1952, прыз на 7-м Міжнар. кінафестывалі (Мкф) у Карлавых Варах], Дымаў («Скакуха»), Атэла («Атэла»), П'ер Бязухаў («Вайна і мір»). Пастаноўкі: «Лёс чалавека» (Вялікі прыз Маск. Мкф 1959 і Лепінская прэмія 1960 за рэжысуру і выкананне ролі Сакалова), 4-серыйная эпапея «Вайна і мір» (1965—67; Вялікі прыз 4-га Маск. Мкф за 1-ю і 2-ю серыі, 1965). Узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: Ханютин Ю. Сергей Бондарчук, М., 1962.

БАНДАРЧУК Васіль Кірылавіч [н. 1.8.1920, в. Цараўцы (Кірава) Слуцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі этнограф. Д-р гістар. н. (1965). З сялян. Чл. КПСС з 1951. Скончыў БДУ (1952). З 1967 нам. дырэктара, з 1969 дырэктар Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Аўтар прац па гісторыі беларускай этнаграфіі, фальклоры і атэізме.

Тв.: (Разам з І. Г. Чыгрынавым) Николай Яковлевич Никифоровский, Мн., 1960; Еўдакім Раманавіч Раманаў, Мн., 1961; Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964; Основные этапы и тенденции в развитии дореволюционной белорусской этнографии, М., 1964.

БАНДАРЫНА Зінаіда Аляксандраўна (11.10.1909, Гродна — 16.4.1959), беларуская савецкая пісьменніца. З сям'і настаўніка. Скончыла Мінскі пед. тэхнікум (1927). Настаўнічала ў бел. школе для перасяленцаў у сібірскім пас. Медзялкова. Скончыла літ.-сцэнарны ф-т Ін-та кінематаграфіі ў Маскве (1933), аспірантуру Акадэміі маст.-знаўства ў Ленінградзе (1937). Працавала ў т-рах Архангельска і Горкага (1938—40). У 1941—43 саніструктар Панфілаўскай дывізіі. Пасля вайны дырэктар Дома нар. творчасці ў Гродне (1946—48), заг. філіяла музея Я. Купалы ў Вязынцы (1948—50), супрацоўнік газ. «Зорька» і «Літаратура і мастацтва» (1950—56). Друкавацца пачала ў 1926. Выдала зб. вершаў «Веснацвет» (1931). Аўтар аповесцей «Шуміць тайга» (1928), «Дыпломная работа» (1953), «Галіна Ільіна» (1959), зб. апавяд. «Лясныя госці» (1960). Аповесць «Ой, рана на Івана» (1956) пра маленства Я. Купалы.

Літ.: Хведаровіч М. Памятныя сустрэчы, 2 выд., Мн., 1963, с. 234—239; Александровіч С. Юнацтва паэта, «Беларусь», 1957, № 6.

БАНДАРБІХІНСКАЯ КУЛЬТУРА, культура 2-й пал. бронзавага веку. Названа па ўрочышчы, што недалёка ад г. Ізюма Харкаўскай вобл. Пры раскопках (1951, 1953) знойдзены формы для адліўкі кельтаў (сякер), крамянёвыя ўкладышы для сярпоў, гліняны посуд з пацеркавымі ўзорамі і інш. У пач. жалезнага веку плямёны Б. к. былі адціснуты скіфамі на р. Дняпро і Сейм.

Літ.: Ильинская В. А. Бондарихинская культура бронзового века, «Советская археология», 1961, № 1.

БАНДАРЭНКА Аляксей Дзмітрыевіч (12.8.1911, с. Паграмец Старавскольскага пав. Курскай губ.— 14.12.1956), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Арлоўскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1942). З сялян. Чл. КПСС з 1932. Да вайны на камсамольскай і парт. рабоце ў Арле і Трубчэўску. Пасля акупацыі Трубчэўска фашыстамі астаўся ў варожым тыле сакратаром падпольнага райкома партыі. З крас. 1942 камісар штаба аб'яднаных партыз. атрадаў (пазней брыгад) паўд.-зах. раёнаў Арлоўскай вобл. Штаб абагульняў вопыт барацьбы партыз. атрадаў Браншчыны, Беларусі і Украіны, распрацоўваў прыёмы і метады баявых дзеянняў. У жн. 1942 правёў канферэнцыю прадстаўнікоў бранскіх, курскіх і ўкраінскіх партыз. атрадаў. Пасля вызвалення Арлоўскай вобл. на парт. рабоце. На XIX з'ездзе партыі выбіраўся канд. у чл. ЦК КПСС.

Літ.: Советские партизаны, М., 1961, с. 186—280. *Л. Ф. Осіпава.* Бранск.

БАНДАРЭНКА Іван Іванавіч [н. 11(24).2.1913, в. Глыбаў Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў камвуз пры ЦК КП(б)Б. Напярэдадні вайны на сав. і парт. рабоце ў Рэчыцкім р-не. З жн. 1941 у тыле ворага. З чэрв. 1943 камандзір партыз. атрада «Смерць фашызму», які дзейнічаў у Стрэшынскім р-не; з вер. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі* Гомельскай вобл. З 1944 на парт. і гасп. рабоце. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Рэчыцы.

БАНДАРЭНКА Пётр Ціханавіч [21.8(3.9).1901, в. Стара-Зяньковіна Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 28.10.1950], савецкі ваенны дзеяч, удзельнік грамадзянскай і Вял. Айч. войнаў, контр-адмірал.



З сялян. Чл. КПСС з 1919. У ВМФ з 1919. Скончыў Ваенна-марское паліт. вуч. (1926), Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1934). У крас.— чэрв. 1920 ваяваў супраць польскіх акупантаў; у жн.— кастр. супраць Урангеля і Махно. З 1926 палітрук крэйсера «Камінтэрн» Чарнаморскага флоту; з 1929 ваен. камісар тральшчыка, з 1930 — падводнай лодкі. З 1934 ваен. камісар курсаў каманднага саставу Чарнаморскага флоту, з 1937 — лінкора «Парыжская камуна». З 1939 нач. паліт. ўпраўлення Чарнаморскага флоту. У Айч. вайну ўдзельнічаў у абароне Адэсы, Ачакава, больш за 7 месяцаў знаходзіўся ў акружаным Севастопалі. З 1942 у дзейнай Волжскай ваен. флатыліі, на Сталінградскім фронце. З 1944 нач. палітаддзела Каспійскай ваен. флатыліі, у 1947—49 нам. камандуючага Чарнаморскага ваенна-марскога флоту. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Літ.: Азаров И. И. Осажденная Одесса, 2 изд., М., 1966. *В. С. Семенякоў.* Мінск.

БАНДУНГ (Bandung), горад у Інданезіі, на в-ве Ява, адм. цэнтр правінцыі Зах. Ява. За 85 *км* на ПдУ ад Джакарты ў самай вялікай на Яве Бандунгскай катлавіне. Важны вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 1085 тыс. ж. (1968). Гал. галіна прамысл.— хім. (вытворчасць хініну, каўчуку). Эл.-техн. з-д, прадпр. лёгкай, харч. прамысл.; чыг. майстэрні. Важны культурны цэнтр краіны: тэхн. ін-т (ф-т Інданезійскага ун-та), Пастэраўскі ін-т (вытв. сываратак і вакцын). Паблізу Лембангская абсерваторыя.

БАНДУНГСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ 1955, першая канферэнцыя 29 краін Азіі і Афрыкі, адбылася 18—24 красавіка ў г. Бандунг (Інданезія).

Ініцыятарамі Б. к. выступілі прэм'ер-міністры Бірмы, Індыі, Інданезіі, Пакістана і Цэйлона на нарадзе ў Каломба (Цэйлон) у крас. 1954. У снеж. 1954 нарада гэтых краін у Богары (Інданезія) вызначыла склад удзельнікаў, мэту і час правядзення Б. к. У ёй, акрамя ініцыятараў, удзельнічалі: Афганістан, Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам, Егіпет, Залаты Бераг, Іран, Ірак, Іарданія, Емен, Камбоджа, КНР, Лаос, Ліберыя, Ліван, Лівія, Непал, Паўд. В'етнам, Саудаўская Аравія, Сірыя, Судан, Тайланд, Турцыя, Філіпіны, Эфіопія, Японія.

Рашэнні Б. к. замацаваны ў рэзалюцыях (аб праблемах залежных народаў, правах чалавека, аб самавызначэнні, эканам. і культ. супрацоўніцтве) і дэкларацыі аб садзеянні ўсеагульнаму міру і супрацоўніцтву, у аснову якой былі пакладзены пяць прынцыпаў мірнага суіснавання (на мове хіндзі *Панча шыла*). Ідэі Б. к. ляглі ў аснову работы *Каірскай канферэнцыі салідарнасці краін Азіі і Афрыкі* (1957—58) і Акрскіх канферэнцый краін Афрыкі (1958).

Літ.: Жуков Е. Конференция стран Азии и Африки в Бандунге и ее историческое значение, «Международная жизнь», 1955, № 5. *З. М. Позняк.* Мінск.

БАНДЫТЫЗМ, арганізацыя ўзброеных бандаў з мэтай нападу на дзяржаўныя, грамадскія ўстановы ці прадпрыемствы або на асобных грамадзян, а таксама ўдзел у такіх бандах і ў нападах, якія яны ўчыняюць. Б. ўласціва наяўнасць арганізаванай узбр. групы з дзвюх і больш асоб, звязаных паміж сабой злачыннай мэтай (арт. 74 КК БССР).

Прыналежнасць да банды можа выяўляцца не толькі ва ўдзеле пэўнай асобы ў нападах, але і ў інш. формах, напр. у забеспячэнні банды зброяй, укрывальніцтве бандытаў і інш. Адказнасць за Б. пастае з 16-гадовага ўзросту. Б.— злачынства, з якім Сав. уладзе давялося весці барацьбу ў першыя гады сацыяліст. будаўніцтва, калі ўзброеныя банды ўтвараліся белагвардзейцамі, кулакамі і дэкласаванымі элементамі. У сувязі з поспехамі ў будаўніцтве сацыялізма ў нашай краіне Б. як сацыяльная з'ява знік. У імперыялісц. краінах Б.— тыповая з'ява. Найбольш шпаркі рост яго назіраецца пасля 2-й сусв. вайны. Узбр. напады ўчыняюцца бандамі прафесійн. злачынцаў, якія карыстаюцца беспакаранасцю і нават прыцягваюцца для барацьбы з камуністамі і інш. прагрэс. дзеячамі. Гл. *Гангстэрызм.* *П. А. Дубавец.* Мінск.

БАНІСТЫКА (франц. bonistique), дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае гісторыю папяровых грашовых знакаў і бонаў. Упершыню папяровыя грошы з'явіліся ў Кітаі ў 650. У Расіі эмісія дзярж. асігнацый пачалася пры Кацярыне II у 1769. Боны (сурагаты папяровых грошай) выпускаліся мясц. гарадскімі ўладамі, установамі і прыватнымі асобамі як заменнікі грошай, найчасцей у час эканам. крызісаў. На Беларусі боны вядомы з часоў паўстання 1863, калі іх выпускалі адміністрацыі маёнткаў, гандл. фірмы, магазіны, касы, рэліг. абшчыны Слуцка, Дзярэчына, Брэста, Высокага, Камянца, Дамачова, Кобрына, Пружан, Пінска і інш. У 1-ю сусв. вайну грашовыя знакі друкаваў грамадзянскі к-т у Навагрудку. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 як грашовыя знакі хадзілі чэкі 6 банкаў і кас Бабруйска і знакі Цэнтр. прадуктовага к-та Палескіх чыгунак у Гомелі. У першыя гады Сав. улады на Беларусі грашовыя знакі выпускалі Мазырскі рэвалюц. к-т (1918, друкаваліся на купонах былых царскіх пазык) і вайсковарэвалюц. к-т у Лідзе; боны — рабочы кааператыў у Гродне (вясна 1919). Свае грашовыя выпускі мелі Магілёўская губ. (1918), Гомельскае гарадское самакіраванне і павятовае земства (1918), Ігуменскі грамадскі банк (1918—19), Рагачоўская гар. ўправа (1918), Слуцкае павят. земства (1919) і інш.

Літ.: Пожеф Р. История денег, пер. с венг., Будапешт, 1968. *М. І. Алексяюк.* Брэст.

БАНІТЭТ ДРЭВАСТОЯЎ, паказчык прадукцыйнасці лесу. Залежыць ад лесарасліннych умоў (урадлівасці глебы, гушчыні дрэвастаяў, травяністай расліннасці і інш.). Аснoўныя паказчыкі прадукцыйнасці лесу — сярэдняя вышыня і ўзрост дрэвастою. Паводле гэтых прыкмет складзены табліцы 5 асн. класаў банітэту (I—V) і некалькі дадатковых. Найб. запасы драўніны ў I і найменшыя ў V класе банітэту. Шкалу класаў банітэту прапанаваў М. М. Арлоў (1911) для насенных і парасткавых дрэвастояў.

БАНІФІКАЦЫЯ (ад позналац. bonificо паляпшаю), накідка на цану тавару, якасць якога вышэй за вызначаную дагаворам. Па ніжэйшае платы за тавар, калі яго якасць ніжэйшая за вызначаную, называецца рэфакцыяй. У СССР Б. ўжываецца пры нарыхтоўцы с.-г. прадуктаў і ў знешнім гандлі. У капіталіст. краінах Б.— 1) зварот падаткаў, якія былі ўзяты з тавараў пры экспарце; 2) дадатковы грашовы ўзнос трымальніка аблігацый дзярж. пазыкі пры канверсіі, калі дзяржава адмаўляецца ад зніжэння працэнта па пазыцы.

БАНІЦІРОЎКА (лац. bonitas дабраякаснасць), 1) ацэнка ўрадлівасці глебы. Праводзіцца па буйнамаштабных глебавых картах у палявых і камеральных умовах. Пры Б. глебы ўлічваюцца працэсы глебаўтварэння, мех. і хім. склад глебаўтваральных і падсцілавых парод, увільготненасць, а пры якаснай і эканам. ацэнцы поля яшчэ і рэльеф, камяністасць, сярэдні контур, аддаленасць ад спажыўца с.-г. прадукцыі, звесткі пра ўраджайнасць асн. с.-г. культур і інш. Вызначаецца ў балах. У БССР пры Б. глебаў карыстаюцца 100-бальнай шкалой. Цана аднаго бала ад 0,17 да 0,42 *ц/га* зерня. Найвышэй, на 94—100 балаў, ацэнены перагнойна-карбанатныя глебы, 62—90 тарфяна-балотныя нізінныя, 61—76 дзярнова-падзолістыя лёгкасуглінкавыя, 18—24 пясчаныя. 2) Комплексная ацэнка жывёлы паводле племянных і прадукцыйных вартасцей. Пры Б. ўлічваюць пародную жывёлы, паходжанне, экстэр'ер, канстытуцыю, якасць патомства. Б. праводзяць заатэхнікі-селекцыянеры ці спецыялісты-баніцёры. Паводле вынікаў Б. фарміруюць племяннóе ядро, племянны маладняк, групу жывёл, не прыдатных на племя, і інш. групы, распрацоўваюць мерапрыемствы для павышэння даходнасці фермаў.

Літ.: Благовидов Н. Л. Качественная оценка земель, М., 1960; Медведев А. Г. и др. Экономическая оценка земель, Мн., 1966.

БАНК МІЖНАРОДНЫХ РАЗЛІКАЎ (БМР), міжнародная фінансавая арганізацыя, заснаваная ў 1930 у Базелі (Швейцарыя) эмісійнымі банкамі Англіі, Бельгіі, Германіі, Італіі, Францыі і некат. японскімі і амерыканскімі прыватнымі банкамі.

Першапачатковай мэтай БМР былі разлікі па рэпарацыйных плацяжах Германіі і міжсаюзніцкіх даўгах, якія ўзніклі ў выніку 1-й сусв. вайны. БМР садзейнічаў пераўзбраенню гітлераўскай Германіі. У першыя гады пасля 2-й сусв. вайны ажыццяўляў аперацыі па шматбаковым клірынгу паміж Францыяй, Італіяй і краінамі Бенілюкса, потым удзельнічаў у разліках па лініі Еўрапейскага плацежнага саюза, а цяпер — Еўрапейскага валютнага пагаднення, куды ўваходзяць 18 краін Зах. Еўропы. БМР дае валютную дапамогу імперыяліст. краінам, купляе і прадае золата і замежную валюту, праводзіць нарады прадстаўнікоў некат. цэнтр. банкаў, выконвае агенцкія функцыі для міжнар. арганізацый, публікуе справаздачы пра стан грашова-крэдытнай і валютнай сістэмы капіталізму. У 1968 капітал банка — 0,5 млрд. залатых швейц. фр., баланс — 8,4 млрд., залаты запас — 3,7 млрд. *В. А. Драздоў.* Мінск.

БАНКА (англ. bank бераг), 1) водмель на дне мора ці акіяна. Бываюць вулканічнага або каралавага паходжання, часам гэта астаткавы рэльеф сушы пры трансгрэсіі мора або ўтворанае хвалямі скопішча ракавін малюскаў. Небяспечныя для суднаходства. Раёны багатых рыбных промыслаў (Ньюфаўндлендская Б. ў Атлантычным ак., Догербанка ў Паўн. моры і інш.). 2) У палеанталогіі — скопішча выкапнёвых ракавін малюскаў або брахіёпод у горных пародах.

БАНКАЎСКІ КРЭДЫТ, 1) у СССР — крэдыт, які выдаюць банкі дзярж. прадпрыемствам, арганізацыям і асобным грамадзянам. 2) У капіталіст. краінах — крэдыт, які выдаюць банкі прамысл. капіталістам, гандлярам і г. д. (ён называецца таксама банкірскім). Гл. *Крэдыт.*

БАНКАЎСКІЯ БІЛЕТЫ (банкноты), крэдытныя грошы. Узніклі ў 17 ст. з развіццём капіталістычнай вэксальнай сістэмы. У перыяд даманапаліст. капіталізму выпускаліся ў парадку крэдытавання тавараабароту і забяспечваліся золатам і вэксалямі. На золата разменьваліся эмісійнымі банкамі. У эпоху агульнага крызісу капіталізму Б. б. ператвараюцца ў *папяровыя грошы.*

Устойлівасць Б. б. падрывалася панаваннем манаполій і фінансавай алігархіі, зрошчваннем

эмісійных банкаў з дзяржавай, ліквідацыяй размену банкнотаў на золата, выпускам Б. б. у памерах, якія перавышалі патрэбу ў грашах. 2-я сусв. вайна павысіла інфляцыю і валютны хаос у капіталіст. свеце, якія амаль поўнасцю ліквідавалі розніцу паміж Б. б. і папяровымі грашыма.

У сацыяліст. краінах Б. б. выпускаюцца планамерна ў адпаведнасці з патрэбамі нар. гасп., што гарантуе іх ад абясцэньвання і выключае неабходнасць размену на золата. Залатая вартасць фіксуецца законам. У СССР Б. б. ўпершыню выпушчаны Дзярж. банкам у 1922 вартасцю 1, 2, 3, 5, 10 і 50 чырвонцаў. Чырвонец быў роўны 10 руб. З 1961 Б. б. выпускаюцца вартасцю 10, 25, 50 і 100 руб.

З. І. Гіяргідзе. Мінск.

БАНКІ (ад позналац. banca лаўка, крама мянялы), пры сацыялізме — дзяржаўныя ўстановы, якія ў планавым парадку крэдытуюць дзейнасць сацыялістычных прадпрыемстваў, фінансуюць капітальныя ўкладанні, праводзяць безнаяўныя разлікі паміж прадпрыемствамі і гаспадарчымі органамі, арганізоўваюць цэнтралізаваны кругазварот наяўных грошай у сацыялістычнай гаспадарцы. Банкаўская сістэма СССР уключае *Дзяржбанк СССР* з падпарадкаванымі яму *ашчаднымі касамі, Будбанк СССР, Знешнегандлёвы банк СССР*. Дзярж. банк — асноўнае звяно банкаўскай сістэмы СССР, эмісійны, крэдытны, разліковы і касавы цэнтр краіны, адзін з найбуйнейшых Б. у свеце. На пач. 1970 ён абслугоўваў каля 600 тыс. кліентаў. Ва ўсіх сацыяліст. краінах Б. выконваюць у асноўным аднолькавыя функцыі. Розніца існуе ў структуры банкаўскай сістэмы, размеркаванні функцый, у метадах крэдытна-разліковага і касавага абслугоўвання нар. гасп. і банкаўскага кантролю. У кожнай краіне ёсць цэнтральныя Б., якія з'яўляюцца эмісійнымі, крэдытнымі і разліковымі цэнтрамі. У многіх краінах створаны Б. па фінансаванні і крэдытаванні капіталаўкладанняў, па крэдытаванні знешняга гандлю і ажыццяўленні міжнар. разлікаў. Сацыяліст. краіны — члены СЭУ — утварылі ў Маскве ў 1964 *Міжнародны банк эканамічнага супрацоўніцтва.*

На тэр. Беларусі ў 1873 буйныя памешчыкі і купцы засн. Мінскі камерцыйны Б., адзін з першых у Расіі. Меў філіялы ў Мінску, Гомелі, на Украіне і адзін у Лібаве. Паспяхова функцыянаваў да пач. 20 ст. У час крызісу панёс страты і паглынуты Азоўска-Данскім Б. Пазней аддзяленні Дзярж. Б. Расіі ў Мінску (адкрыты ў 1881), у Віцебску і Магілёве (1883), Гродне (1884) крэдытавалі буйную буржуазію і крэдытныя ўстановы. Баланс на 1.1.1914 — 32,5 млн. руб. Філіялы расійскіх акцыянерных камерцыйных Б. адкрываліся ў пач. 20 ст. Да пач. 1-й сусв. вайны, калі працэс канцэнтрацыі Б. у Расіі ў асноўным закончыўся, на Беларусі дзейнічалі аддзяленні Б.: Злучанага (баланс на 1.1.1914 — 5,6 млн. руб.), Руска-Азіяцкага (13,1), Віленскага прыватнага (11,5), Азоўска-Данскога (7,3), Маскоўскага (1,4), Руска-Французскага (2,8). Агульны аб'ём крэдытных укладанняў на 1.1.1914 — 38,6 млн. руб. Праз гэтыя аддзяленні ішоў прыток каротказтэрміновых пазыковых капіталаў з інш. раёнаў Расіі, што прыносіла Б. вялікі прыбытак, які ў 1913 перавысіў 1 млн. руб. На Беларусі Б. вялі вострую канкурэнтную барацьбу. У губернскіх і павятовых цэнтрах адначасова дзейнічалі філіялы розных банкаў. Найважнейшую ролю адыгрывалі Руска-Азіяцкі, Азоўска-Данскі, Злучаны і інш. У вялікіх павятовых цэнтрах гал. роля належала Злучанаму і Віленскаму Б. Аднак усе гэтыя аддзяленні не задавальнялі патрэбы Беларусі ў крэдыце, што спрыяла пранікненню замежнага капіталу, які за бясцэнак вывозіў лес, лён і інш. сыравіну. Недахоп крэдытаў буйных Б. спрыяў таксама дзейнасці розных прыватных банкірскіх кантор, дыскантараў і невялікіх крэдытных устаноў. Напр., у 1874 з'явіліся таварыствы ўзаемнага крэдыту (Мінскае і Магілёўскае). Да пач. 20 ст. іх было 9, а да 1914 — 74. Найбольшыя з іх Мінскае, Магілёўскае, Віцебскае, Гомельскае, Пінскае і інш. Па аб'ёме аперацый некаторыя таварыствы ўзаемнага разліку апярэджвалі філіялы акцыянерных Б. У сярэдзіне 19 ст. пачалі з'яўляцца крэдытныя кааператывы, аб'яднанні дробных гандляроў, рамеснікаў, сялян (часта іх узначальвалі буйныя купцы ці іх стаўленікі), а таксама падобныя да іх саслоўныя крэдытныя ўстановы. Шырокая дзейнасць іх пачалася з часу сталыпінскай рэформы і перадваеннага прамысл. ўздыму. Астатак выдадзеных пазык усімі саслоўнымі, крэдытнымі (у т. л. і земскімі) установамі на 1.1.1908 склаў 5,4 млн. руб., а на 1.1.1914 — 25,6 млн. руб. і перавысіў укладанні Дзяржбанка. Гомельскі (Мікалаеўскі) сялянскі банк быў адным з найбуйнейшых сярод устаноў гэтага тыпу (баланс на 1.1.1914 — 0,5 млн. руб.). Гарадскія грамадскія Б. былі адкрыты ў Гомелі (1870), Полацку (1874), Віцебску (1882), Барысаве (1900), Магілёве (1908). Іпатэчныя Б. былі прадстаўлены аддзяленнямі дзяржаўных Сялянскага пазямельнага (аперацыі з 1883), Дваранскага зямельнага, акцыянерных зямельных (1872), Віленскага (ва ўсіх павятовых цэнтрах), Маскоўскага (Віцебск, Мінск, Магілёў), С.-Пецярбургска-Тульскага (Гродна) Б. і Мінскім гарадскім т-вам (1896). У гэтых Б. было закладзена больш за палову ўсіх прыватнаўласніцкіх зямель (6,6 млн. дзесяцін) і значная частка нерухомай маёмасці ў гарадах. Запазычанасць землеўладальнікаў да пач. 1914 дасягнула 217 млн. руб., а ўладальнікаў гарадской маёмасці 31,5 млн. руб. Запазычанасць сялян за зямлю (1,7 млн. дзесяцін), купленую пры садзеянні Сялянскага Б., склала больш за 71,2 млн. руб. Сялянскі Б. спрыяў развіццю кулацтва, прыводзіў да збяднення сялян, якія, выкарыстаўшы пазыку, не маглі рабіць па ёй своечасовыя плацяжы. Дваранскі Б., адмаўляючы ў крэдытах памешчыкам польскага паходжання, прымушаў іх карыстацца больш дарагім крэдытам акц. банкаў, што адмоўна ўплывала на сельскую гаспадарку.

Б. Сав. Беларусі пачалі фарміравацца адразу пасля Кастр. рэв., аднак спынілі сваю дзейнасць у перыяд ваеннага камунізма. Зноў пачалі стварацца пасля пераходу да новай эканам. палітыкі. У студз. 1922 Дзяржбанк РСФСР адкрыў у Мінску рэсп. кантору, потым аддзяленні і агенцтвы ў гарадах і раённых цэнтрах. Стварэнне сеткі Прамбанка і Усебанка закончылася ў 1924. У студз. 1923 адкрыты Гомельскі рабочы Б. (Раббанк), які ў 1924 ператвораны ў мясцовы камунальны банк, а ў 1927 падпарадкаваны Белкамунбанку (створаны ў 1925). З мэтай канцэнтрацыі свабодных сродкаў для крэдытавання с. гасп. створаны таварыствы с.-г. крэдыту: Беларускае і Гомельскае (1923), Віцебскае і Аршанскае (1924), Калінінскае (1925), Бабруйскае і Магілёўскае (1926), Мазырскае і Полацкае (1927). Беларускае т-ва ў 1924 ператворана ў Белсельбанк, які ўзначаліў усю сістэму с.-г. крэдыту. Белсельбанк і Камунальныя Б. былі мясцовымі акцыянернымі, мелі падтрымку цэнтральных саюзных Б. Прыватнаму капіталу было дазволена адкрываць таварыствы ўзаемнага крэдыту. Сав. Б. адыгралі вялікую ролю ў аднаўленні і развіцці нар. гасп., у барацьбе за выцяснение прыватнага капіталу (астатак па крэдытных укладаннях у пар. гасп. на 1.10.1926 — 57,3 млн. руб., на 1.11.1929 — 170 млн. руб.). Пры падрыхтоўцы і правядзенні калектывізацыі с. гасп. крэдытная кааперацыя аб'яднала (1929) больш за 300 тыс. сялянскіх гаспадарак (астатак выдадзеных ёю пазык на 1.10.1929 перавысіў 22,4 млн. руб.). Пасля крэдытнай рэформы 1930—32 акцыянерныя Б. і крэдытныя т-вы ліквідаваны. З ліквідацыяй прыватнага капіталу перасталі існаваць і т-вы ўзаемнага крэдыту. Пасля 1959 на Беларусі асталіся філіялы Дзяржбанка і Будбанка (рэсп. канторы, абласныя канторы і аддзяленні).

У капіталістычных краінах Б. ажыццяўляюць пасрэдніцтва ў плацяжах, разліках і крэдыце паміж капіталістамі. Неабходнасць Б. для капіталіст. вытворчасці абумоўлена працэсам цэнтралізацыі свабоднага грашовага капіталу і імкненнем капіталістаў найбольш поўна выкарыстаць яго. Б. садзейнічаюць паскарэнню канцэнтрацыі капіталу і ўтварэнню прамысл. манаполій. Разам з канцэнтрацыяй вытв. адбываецца канцэнтрацыя Б. і ўтварэнне банкаўскіх манаполій. Пры канцэнтрацыі і зрошчванні банкаўскага і прамысл. капіталу ўзнікаюць *фінансавы капітал* і *алігархія фінансавая*. Банкі пры капіталізме «ператвараюць бяздзейны грашовы капітал у дзейны, г. зн. такі, які прыносіць прыбытак, збіраюць усе і ўсялякія грашовыя даходы, аддаючы іх у распараджэнне класа капіталістаў» (Ленін У. І., Тв., т. 22, с. 200). Буйныя Б. ў эпоху імперыялізму ператварыліся ў цэнтр. вузлы капіталіст. эканомікі. Гэта дае магчымасць фінансавай алігархіі выкарыстоўваць Б. для забеспячэння свайго панавання ў эканам. і паліт. жыцці. Паводле характару дзейнасці капіталіст. банкі падзяляюцца на камерцыйныя (крэдытаванне, аперацыі з акцыямі і аблігацыямі прамысловых прадпр., разлік), інвестыцыйны (мабілізацыя сродкаў гал. ч. шляхам выпуску ўласных акцый і ўклад іх у вытворчасць, удзел у арганізацыі прамысл. кампаній і г. д.), эмісійныя (выпускаюць банкноты, рэгулююць абарачэнне валюты, крэдытуюць інш. банкі), іпатэчныя (пазыкі пад заклад нерухомай маёмасці), знешнегандлёвыя (міжнар. разлікі і крэдыты), ашчадныя, сельскагасп. і інш. Паводле прыналежнасці падзяляюцца на прыватныя, дзяржаўныя, змешаныя, кааператыўныя і міждзяржаўныя. Гл. таксама *Федэральная рэзервовая сістэма ЗША, Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця.*

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 3, Мн., 1953, адд. 4—5; Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Атлас М. С. Развитие банковских систем стран социализма, М., 1967; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967, Мн., 1967.

З. І. Гіяргідзе, В. А. Драздоў, В. Ф. Сонцаў, В. У. Цімашэнка. Мінск.

БАНКНОТЫ (англ. bank-note), гл. *Банкаўскія білеты.*

БАНКРУЦТВА (італьян. banco лаўка + rotto зламаны), у капіталістычных краінах няздольнасць або адмова даўжніка (прадпрыемства, акцыянернага таварыства, фірмы, дзяржавы) плаціць крэдыторам па пазыковых абавязацельствах з-за адсутнасці сродкаў. Пераносна — крах, правал планаў, няздольнасць выканаць абавязацельствы (матэрыяльныя і інш.).

Б.— пастаяннае з'ява ў капіталіст. гр-ве, спадарожнік анархіі вытворчасці. Напр., у 1967 у ФРГ было зарэгістравана больш як 3 тыс. выпадкаў Б. розных прадпр. і фірмаў. У час эканам. крызісу Б. прамысл. і гандл. прадпрыемстваў мае масавы характар і выклікае крах банкаў, крызіс грашова-крэдытнай сістэмы цалкам. Дзярж. Б. выяўляецца ў розных формах: хранічны бюджэтны дэфіцыт, поўная або частковая нявыплата ўнутраных і знешніх даўгоў, *дэвальвацыя, інфляцыя* і інш. Бывае паўмыснае Б., калі дзяржава адмаўляецца выплачваць свае даўгі інш. краіне (фашысцкая Германія ў 1933 адмовілася плаціць па рэпарацыйных даўгах, Англія не сплаціла сваіх даўгоў Індыі, Егіпту за пастаўкі ў час 2-й сусветнай вайны).

БАНКУЗАЎ Анатоль Іванавіч (н. 15.1.1921, в. Мхінічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.), Герой Савецкага Саюза (1945). Генерал-маёр (1953). З служачых. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. На франтах Айч. вайны з 22.6.1941: камандзір роты, пазней — палка. Удзельнічаў у абароне Ленінграда, Петразаводска, Мурманска, у вызваленні Вязьмы, Невеля, Гарадка, Віцебска, Оршы, Барысава, Мінска, Ліды, ва ўзяцці Тыльзіта, Інстэрбурга, Пілаў, Кёнігсберга. Полк, якім камандаваў Б., вызначыўся зімой 1945 у баі за ўмацаваную крэпасць і ваенна-марскую базу каля г. Пілаў. Пасля вайны камандаваў дывізіяй. Жыве ў Маскве.



БАННІКАЎ Барыс Фёдаравіч (12.10.1923, в. Таранкі Кацельніцкага пав. Вяцкай губ.— 12.10.1943), удзельнік баёў па Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943. Вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра. Радавы Б. арганізаваў групу добраахвотнікаў з 4 чал., якія на гумавай лодцы пераплылі раку, гранатамі выбілі гітлераўцаў з траншэй, чым забяспечылі роце магчымасць пераправіцца цераз Дняпро. Б. загінуў у баі.

БАНОЛЬДЗІ Джузепе Ахіла Эльміра (1821—71), удзельнік паўстання 1863 па Беларусі і ў Літве, грамадскі дзеяч, спявак, танцмайстар. Італьянец па паходжанні, н. ў Барселоне (Іспанія), вучыўся ў Лазанскім ун-це. З 1842 жыў у Вільні. Быў настаўнікам спеваў у Дваранскім ін-це, займаўся перакладамі, выступаў як спявак — выканаўца твораў С. Манюшкі. Прыхільнік партыі «чырвоных», у 1862 з К. Каліноўскім увайшоў у Літоўскі правінцыяльны камітэт. У заснаванай ім фотамайстэрні рыхтаваліся падпольныя выданні. У лют. 1863 Віленскі паўстанцкі цэнтр (Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі) прызначыў яго сваім прадстаўніком за мяжой і даручыў закупку зброі. У час Парыжскай камуны 1871 капітан, камандзір эскадрона ў злучэннях В. *Урублеўскага.* Памёр ад ран.

Літ.: Генерал Мерославский... и Ахиллес Бопольди, виленский фотографщик, танцмейстер, певец и главный агент Национального правительства Отдела литовских провинций, Вильна, 1864.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

БАНТУ МОВЫ, група сваяцкіх моў у Цэнтральнай і Паўднёвай Афрыцы. Асн.: суахілі, зулу, ганда, конга, сота, луба, нгала. Некат. мовы дзяржаўныя, з пісьмовай л-рай.

На Б. м. гавораць больш за 71 млн. чал. Характэрныя рысы: аглюцінацыя (з элементамі флектыўнасці) і сістэма іменных класаў (усяго 21 клас, але не ўсе яны ёсць у розных мовах). Прыналежнасць імя да пэўнага класа залежыць ад лагічнай суаднесенасці паняцця (чалавек, расліна, прылада і інш.) і выражаецца прыстаўкамі. Разам з займеннікамі прыстаўкі выконваюць важную ролю ў сінтаксісе: кожнае слова аднаго сінтакс. комплексу набывае паказчык гал. слова. У Б. м. параўнальна простая фанетыка, якая вывучана лепш за марфалогію і сінтаксіс. Гл. таксама *Народы Афрыкі*, раздз. Мовы.

Літ.: Африканское языкознание. Сб. ст., М., 1963; Doke C. Bantu. Modern grammatical, phonetical and lexicographical studies since 1860, London, 1945.

А. Я. Міхневіч. Мінск.

БАНТЫШ-КАМЕНСКІ Мікалай Мікалаевіч [16(27).12.1737, Нежын, Украіна — 20.1(1.2).1814], рускі і ўкраінскі дваранскі гісторык і археограф. Кіраўнік Маскоўскага архіва Калегіі замежных спраў (1783—1814), склаў многія археаграфічныя зб., у т. л. ў 1780—84 пяцітомны «Дыпламатычны збор спраў паміж рускім і польскім дварамі... да 1700» (выд. пад назвай «Перапіска паміж Расіяй і Польшчай да 1700», т. 1, 1848; ч. 1—3, 1861). У 1795 напісаў «Гістарычную звестку пра ўзнікненне ў Польшчы уніі...» (М., 1805; Вільня, 1864), дзе падаў гісторыю шляхецка-каталіцкага панавання ў Правабярэжнай Украіне і на Беларусі. Асноўны твор «Агляд знешніх зносін Расіі» (ч. 1—4, 1894—1902).

Літ.: Бантыш-Каменский [Д. Н.]. Словарь достопамятных людей Русской земли, ч. 1, СПб., 1847, с. 59—86.

БАНУШ (Banuș) Марыя (н. 10.4.1914, Бухарэст), румынская паэтэса, камуністка. Першы зб. «Краіна дзяўчат» (1937). У цыклах «Песня пад танкамі» (1940—44), «Сакавіцкі вецер» (1944—48) гучаць антыфаш. матывы. Пра сацыяліст. Румынію, інтэрнац. салідарнасць працоўных, барацьбу за мір напісала зб. «Радасць» (1949), «Пра зямлю» (1952), «Да цябе звяртаюся, Амерыка» (1955). Роздум пра жыццё, смерць, каханне ў зб. «Адкрыўся свет» (1956), «Каля варотаў раю» (1958), «Метамарфозы» (1963), «Янтар» (1965). Аўтар п'ес «Вялікі дзень», «Закаханыя». Перакладала творы А. Пушкіна, Г. Гейнэ, П. Неруды, Назыма Хікмета. Аўтар зб. перакладаў «З любоўнай паэзіі свету» (1965). Дзярж. прэмія 1951.

Тв.: Бел. пер. у час.: «Беларусь», 1952, № 5; «Маладосць», 1954, № 1, 1959, № 8; «Полымя», 1963, № 10; рус. пер.— Великий день, М., 1954; Стихи, М., 1960.

БАНЦАРАЎШЧЫНА, гарадзішча на левым беразе Свіслачы, за 10 *км* на ПнЗ ад Мінска. Умацавана валамі і равамі. Даследавалася С. А. Дубінскім (1926—28), А. Р. Мітрафанавым (1948—49). Мае 2 пласты — ніжні (3 ст. да н. э.— 4 ст. н. э.) і верхні (6—8 ст. н. э.). Пры раскопках ніжняга пласта выяўлены жалезныя сярпы, нажы, накапечнікі коп'яў, шылы, фібула, шпількі, бронзавыя пярсцёнкі, падвескі і інш. Гліняны посуд ручнога вырабу (вастрарэбрыя і слоікападобныя гаршкі). На яго сценкі наносіліся штрыхі (адсюль і ўся культура атрымала назву штрыхаванай керамікі), на верхнюю частку — арнамент (зашчыпы, ямкі, насечкі). Жыхары займаліся лядным земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам; здабывалі і апрацоўвалі жалеза, плавілі бронзу і інш. каляровыя металы; апрацоўвалі дрэва і косць. У верхнім пласце знойдзены сляды наземных жылых пабудоў, рэшткі печаў-каменак, прылады працы, аздоба (бронзавы бранзалет, лунніца). Посуд гладкасценны слоікападобнай і міскападобнай формы, гаршкі з адагнутым венчыкам і своеасаблівым рабром пасярэдзіне. Жыхары культуры верхняга пласта Б. займаліся ворным земляробствам і жывёлагадоўляй; паляванне і рыбалоўства мелі падсобны характар.



Упрыгожанні з гарадзішча Банцараўшчына.

Літ.: Митрофанов А. Г. Банцеровское городище, у кн.: Белорусские древности, Мн., 1967; Дубінскі С. А. Доследы культур жалезнага перыяду..., у кн.: Працы кафедры археалогіі, т. 1, Мн., 1928.

А. Р. Мітрафанаў. Мінск.

БАНЬКІ, вёска ў Комсеніцкім с/с Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 20 *км* на ПдУ ад Круглага, 50 *км* ад Магілёва, 39 *км* ад чыг. ст. Талачын, каля шашы Круглае — Магілёў (3 *км*). 149 ж., двароў 50 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам.

БАНЬКІ МЕДЫЦЫНСКІЯ, круглыя шклянкі ёмістасцю 30—70 *см*³ з тоўстымі гладкімі краямі і расшыраным паўкруглым дном. Спрыяюць прыліву крыві да скуры (застойная гіперэмія), папярэджваюць і ліквідуюць запаленні ўнутраных органаў і тканак. Ставяцца (20—30 штук) на грудзі (не на вобласць сэрца), бакі і спіну пры пнеўманіі, бранхіце, плеўрыце, неўралгіі, радыкуліце і інш. хваробах.


БАПТЫСТЫ (ад грэч. baptistēs хрысціцель), прыхільнікі адной з найбольш пашыраных сектаў у хрысціянстве. Упершыню секты Б. узніклі ў пач. 17 ст. ў Англіі сярод дробнай буржуазіі. Асабліва пашырыліся яны ў ЗША і Германіі. У Расіі Б. з'явіліся пасля рэформы 1861 на Пд Украіны, у Паволжы, Закаўказзі сярод дробнай буржуазіі і заможных сялян. На Беларусі першая абшчына Б. узнікла на Гомельшчыне ў канцы 70-х г. 19 ст. Занеслі баптызм сяляне, якія набывалі ў заработках у Херсонскай і інш. губернях Украіны. Потым Б. праніклі ў Магілёўскую, Віцебскую і Мінскую губ. Кіраўніцтва Б. варожа сустрэла Кастр. рэвалюцыю, і толькі ў 1926 пад націскам радавых веруючых баптысцкія арг-цыі заявілі пра сваю лаяльнасць да Сав. улады. У 1944 Б., евангельскія хрысціяне і ў 1945 пяцідзесятнікі аб'ядналіся ў самую вялікую ў СССР секту — «Царкву евангельскіх хрысціян-баптыстаў» на чале з Усесаюзным саветам евангельскіх хрысціян-баптыстаў. У 1963 да іх далучылася частка менанітаў. Гэтая секта

ўваходзіць у Сусветны савет Б., цэнтр якога знаходзіцца ў ЗША (Вашынгтон). З пач. 60-х г. у абшчынах евангельскіх хрысціян-баптыстаў ідзе раскол. Абшчыны, якія адкалоліся ад Усесаюзнага савета евангельскіх хрысціян-баптыстаў, у 1965 абвясцілі стварэнне Савета цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Кіраўнікі гэтай часткі Б. імкнуцца распаліць фанатычныя настроі сярод веруючых, штурхаюць іх на шлях процізаконных, антыграмадскіх дзеянняў. У 60-я г. 20 ст. ў свеце налічвалася каля 25 млн. Б., з іх да 20 млн. у Паўн. Амерыцы. Веравызнанне Б. заснавана на біблейскіх тэкстах. Б. прызнаюць стварэнне богам свету, «святую тройцу», бессмяротнасць душы. Галоўнае ў іх веравызнанні — ідэя, што чалавек схільны да грахоў ад прыроды і што толькі вера ў Хрыста не дае яму грашыць. Шырока прапагандуецца рэліг. мараль, паводле якой чалавек павінен свой вольны час аддаць служэнню богу. Б. патрабуюць «свядомага» прыняцця веры і не прызнаюць складанай сістэмы традыцыйнага хрысціянскага культу (абразоў, хрышчэння дзяцей і інш.). Іх асноўны абрад — хрышчэнне ў сталым узросце. Пропаведзь Б. маральнага самаўдасканалення ў адрыве ад барацьбы за сац. справядлівасць наскрозь ілжывая і мае на мэце адцягнуць веруючых ад грамадска-палітычнага жыцця, ад рэчаіснасці. Ва ўмовах капіталіст. ладу баптызм — адзін з сродкаў умацавання яго асноў, у сацыяліст. краінах — тормаз у будаўніцтве новага грамадства.

Літ.: Причины существования и пути преодоления религиозных пережитков, Мн., 1965, с. 128—138; Митрохин Л. Н. Баптизм, М., 1966; Лепсу М. Я. Кто такие «инициативники»?, Мн., 1967; Баптизм и баптисты, Мн., 1969.

Е. С. Пракошына. Мінск.

БАПТЫСТЭРЫЙ (грэч. baptistērion басейн для купання), хрысцільня. Звычайна самастойны, круглы або многавугольны ў плане будынак, накрыты купалам. Падчас у цэнтры будынка змяшчаўся басейн для абраду хрышчэння. Найбольш вядомыя: Латэранскі Б. у Рыме (4—5 ст.); Б. праваслаўных (сярэдзіна 5 ст.) і арыян (канец 5 — пач. 6 ст.) у Равене; фларэнтыйскі Б. Сан-Джавані (асвячоны ў 1059, апсіда і мармуровая дэкарацыя інтэр'ера 13 ст.); Б. саборнага комплексу ў Пізе (заложаны ў 1153).




Баптыстэрый у Пізе. Арх. Дыятысальві.

БАР у геаграфіі, пясчаная падводная водмель у моры каля вусця ракі (прывусцевы Б.) або вузкая выцягнутая паўз бераг напосная паласа сушы (ці ланцуг а-воў), што аддзяляюць лагуну ад мора (берагавы Б.). Утвараюцца ад сукупнага дзеяння цячэння ракі, марскіх хваляў, прыліваў-адліваў. Напр., Арабацкая стрэлка ў Азоўскім м.

БАР (ад грэч. báros цяжар), пазасістэмная адзінка вымярэння ціску, роўная 100 000 *н/м*². У тэхн. вымярэннях замяняе атмасферу (1 Б.=1,02 *ат*). У метэаралогіі карыстаюцца мілібарам (0,001 Б.). Раней барам называлі адзінку ціску ў сістэме СГС, роўную 1 *дын/см*², за якой цяпер замацоўваецца назва барыя.

БАРАБА́Н (цюрк.), 1) у архітэктуры — цыліндрычная ці шматгранная частка будынка, на якой ставяць купал ці шматгранны самкнуты скляпенні. Бывае з аконнымі




праёмамі (светлавы Б.). Уласцівы драўлянай (цэрквы рус. поўначы) і мураванай архітэктуры (Арменія, Грузія, Стараж. Русь і інш.). 2) У музыцы — ударны муз. інструмент. Гук неакрэсленай вышыні ўзнікае ад удараў драўляных палачак ці калатушкі па скуры, пацягнутай на цыліндрычны корпус (кадла). У сімф. і духавых аркестрах ужываюцца вялікі Б. з моцным глухім гукам і малы (ваенны) з сухім траскучым гукам. 3) У тэхніцы — дэталь машын і апаратаў, якая мае форму парожняга цыліндра, а таксама некаторыя машыны з цыліндрам у якасці асн. элемента (напр., Б. для галтоўкі вырабаў, Б. для ачысткі ліцця). Рабочы орган грузападымальных і ўрубавых машын, горных камбайнаў і інш. У катлабудаванні і хім. апаратабудаванні Б. называюць таўстасценныя цыліндрычныя сасуды, у якіх працэсы адбываюцца пры высокім ціску. Б.— асноўны апарат, у якім дубяць, тлусцяць і фарбуюць скуры ў гарбарнай вытворчасці. Ёсць магнітныя Б., якія ўжываюцца ў спалучэнні з транспартавальнымі машынамі, каб даставаць магнітныя матэрыялы з грузаў.

БАРАБА́ННАЯ ПЕРАПО́НКА, тонкая злучальна-тканкавая пласцінка, якая аддзяляе вонкавы слыхавы праход ад барабаннай па-

ласці (гл. *Вуха*). Гал. функцыя — перадача гуку і яго ўзмацненне. Гукавыя хвалі, дасягаючы Б. п., надаюць ёй ваганне, а яно праз слыхавыя костачкі перадаецца ўнутранаму вуху.

БАРАБУДУР (Borobudur літар. узгорак-храм), выдатны помнік сусветнай архітэктуры 2-й пал. 7 — пач. 9 ст. ў даліне Кеду на в-ве Ява (Інданезія). Б.— прыземістая ступеньчатая піраміда (35,5 *м* вышыні) з блакітна-шэрага андэзіту, збудаваная на схілах



Барабудур. Агульны выгляд.

прыроднага ўзгорка. 5 *км* абходных ярусаўтэрас (5 квадратных і 3 круглыя ў плане) вядуць да верхняй тэрасы і да галоўнага ступа, які ўвенчвае храм. Ён абкружаны 72 ажурнымі ступа меншага памеру. Уздоўж абходных тэрас размешчаны 1460 шматфігурных кампазіцый і 1212 дэкар. рэльефаў; у нішах сцен і ступа верхніх ярусаў статуі Буды (каля 500).

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 1, М., 1958, с. 320—321; Прокофьев О. Искусство Юго-Восточной Азии, М., 1967, с. 63—85; Ротенберг Е. Искусство Индонезии, у кн.: Всеобщая история искусств, т. 2, кн. 2, М., 1961, с. 267—273.

БАРАВАЯ, вёска ў Першамайскім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Радзіма». За 27 *км* на ПнУ ад Слуцка, 98 *км* ад Мінска, 75 ж., двароў 25 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. У Вял. Айч. вайну Б. спалілі фашысты.

БАРАВАЯ БУДА, вёска ў Струкачоўскім с/с Кармянскага р-на Гомельскай вобл., на р. Чачэра. Цэнтр саўгаса імя Чапаева. За 18 *км* на ПдЗ ад Кармы, 102 *км* ад Гомеля, 68 *км* ад чыг. ст. Рагачоў. 586 ж., гасп. 167 (1970). Цагельня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддаленне сувязі, сталовая, магазін.

БАРАВІК, белы грыб (Boletus edulis), высокакаштоўны ядомы грыб сямейства балетусавых. Шапка паўшарападобная, 8—20 *см* у дыяметры. У залежнасці ад умоў росту колер яе мяняецца ад белага да фіялетава-карычневага. Ножка цыліндрычная або клубнепадобная, белаватая, з тонкім сеткавым малюнкам. Мякаць белая, прыемна пахне, на зломе не мяняе колеру. Адрозніваюць Б. сасновы, яловы, бярозавы, дубовы, грабовы. У лясах БССР расце ў чэрв.— кастр. Багаты на бялок, вугляводы, тлушчы, мінер. рэчывы; мае вітаміны А, В, С, Д, РР. Спажываюць Б. свежыя (смажаныя, вараныя), марынаваныя, сушаныя. Гл. іл. на ўкл. да арт. *Грыбы*.

БАРАВІК Аляксандр Аляксандравіч [н. 29.9(12.10).1904, в. Сяргеенкі Полацкага пав. Віцебскай губ.], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1931. З 1928 на сав.-гасп. рабоце. Скончыў у Віцебску сав.-парт. школу (1933). Напярэдадні вайны працаваў у Крывіцкім р-не Вілейскай вобл. З першых дзён Айч. вайны ў тыле ворага. З ліп. 1941 камандзір партыз. ўзвода, з ліп. 1942 камісар атрада імя Гарбачова ў Любанскім р-не, са студз. 1943 камісар *партызанскай брыгады № 25* імя Панамарэнкі і сакратар Любанскага падпольнага РК КП(б)Б. Пасля вайны на парт. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. п. Старобін Мінскай вобл.

БАРАВІКІ, бескурганны могільнік *мілаградскай культуры* (7 ст. да н. э.— 1 ст. н. э.). За 1 *км* на Пн ад в. Баравікі Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Даследаваўся Л. Д. Побалем і У. Ф. Ісаенкам у 1964. Знойдзены кругладонныя ляпныя гаршкі пачатку жалезнага веку (7—5 ст. да н. э.) і інш. Рэчы зберагаюцца ў Дзярж. музеі БССР і Юравіцкім краязнаўчым музеі (Калінкавіцкі р-н).

БАРАВІКІ, вёска ў Рубілкаўскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 21 *км* на У ад Дзяржынска. 30 *км* ад Мінска, 15 *км* ад чыг. ст. Фаніпаль, каля шашы Негарэлае — Самахвалавічы (1 *км*). 88 ж., двароў 27 (1970). Млын, швейная майстэрня, клуб, магазін.

БАРАВІКІ, вёска ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., на р. Сведзь. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Баравікі». За 16 *км* на ПдУ ад Светлагорска, 94 *км* ад Гомеля, 19 *км* ад чыг. ст. Светлагорск-на-Бярэзіне, на шашы Гомель — Светлагорск. 1147 ж., двароў 322 (1970). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. На брацкай магіле помнік сав. воінам.

БАРАВІКОЎСКІ Уладзімір Лукіч [24.7(4.8).1757, Міргарад — 6(18).4.1825], рускі жывапісец-партрэтыст. Акадэмік (1795), саветнік (1802) Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Вучыўся ў І. Лампі. У партрэтах Б. 90-х г. найбольш ярка выявіліся ідэі сентыменталізму ў рус. жывапісе. Б. імкнуўся стварыць вобраз натуральнага, здольнага на тонкія перажыванні, паэт. мары і эле-



гічны настрой чалавека (партрэты А. А. Менеласа, канец 80—90-х г.; В. В. Капніста, пач. 90-х г; К. М. Арсеньевай, каля 1796; М. І. Лапухінай, 1797; А. Г. і В. Г. Гагарыных, 1802, і інш.). Цікавы, адзначаны рысамі інтымнасці партрэт Кацярыны II (1794), якая паказана на прагулцы ў парку без царскіх рэгалій. У мужчынскіх партрэтах увасоблены ідэал паважанага дзеяча дзяржавы (Д. П. Трашчынскага, Ф. А. Бароўскага, абодва 1799; А. Ф. Бястужава, 1806, і інш.). Пасля 1800 у творчасці Б. паяўляюцца рысы класіцызму (партрэты А. І. Безбародка з дочкамі, 1803; А. А. і М. І. Далгарукіх, 1811; А. Л. дэ Сталь, 1812, і інш.). Б. належаць парадныя партрэты (Муртаза-Кулі-Хана, 1796; А. Б. Куракіна, 1801—02, і інш.) і рэдкі ў мастацтве таго часу паказ сялян («Хрысціння», каля 1795; «Зіма ў вобразе селяніна», 1-е дзесяцігоддзе 19 ст.). У 1793—94 стварыў абразы для Іосіфаўскага сабора ў Магілёве.



У. Л. Баравікоўскі. Партрэт Е. У. Радзянка. 1821. Дзярж. маст. музей БССР.

Літ.: Архангельская А. И. Боровиковский, М., 1946; Алексеева Т. В., В. Л. Боровиковский, у кн.: История русского искусства, т. 7, М., 1961.

БАРАВІЦА, вёска ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 10 *км* на ПнУ ад г. п. Кіраўск, 81 *км* ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна, на шашы Бабруйск — Магілёў. 310 ж., двароў 90 (1970). Сярэдняя школа, дзіцячы сад, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны.

БАРАВОЕ, кліматычны і кумысалячэбны курорт у Шчучынскім р-не Какчэтаўскай вобл. Казахскай ССР. Гар. пасёлак (8 тыс. ж., 1968) у горна-лясным масіве, за 20 *км* ад чыг. ст. Курорт Баравое (г. Шчучынск). Паводле кліматычных умоў адзін з найлепшых у Азіяцкай ч. СССР курортаў для туберкулёзных хворых. Сухі стэпава-лясны клімат. Многа азёраў. Ад халодных вятроў заслонены высокімі гарамі. Шырока практыкуецца лячэнне кумысам. Слаба мінералізаваная хларыдна-натрыевая вада і высакаякасныя лячэбныя азёрныя гразі. Лячэнне ад туберкулёзу, хвароб органаў руху і апоры, дыхання, кровазвароту і інш. Сезон — увесь год.

БАРАВОЕ, вёска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Горкага. За 10 *км* на ПдЗ ад Дзяржынска, 45 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Негарэлае. 288 ж., двароў 99 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, мед. і вет. пункты, аддз. сувязі, магазін. Баявыя дзеянні Сав. Арміі каля Б. ў Айч. вайну апісаны ўдзельнікам баёў І. Ф. Стаднюком у рамане «Чалавек не здаецца» (ёсць аднайменны фільм). На брацкай магіле помнік сав. воінам. Помнік-абеліск 243 жыхарам Бараўскога с/с, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам.

БАРАВОЕ, вёска ў Маркоўскім с/с Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл., на р. Убарць. Цэнтр калгаса «Звязда». За 24 *км* на ПдЗ ад г. п. Лельчыцы, 239 *км* ад Гомеля, 91 *км* ад чыг. ст. Ельск. На шашы г. п. Лельчыцы — в. Глушкавічы. 1484 ж., двароў 352 (1970). Лясніцтва Мілашавіцкага лясгаса, участак Ельскага леспрамгаса. Сярэд. школа, клуб, б-ка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 4 магазіны.

БАРАВУХА, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобласці. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Бігосава — Полацк. За 20 *км* на ПнЗ ад Полацка, 120 *км* ад Віцебска, каля шашы Полацк — Рыга (1 *км*). 1378 ж., двароў 741 (1970). Атэлье раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, урачэбны ўчастак, аптэка, аддз. сувязі, рэстаран, 9 магазінаў. У гады ням.-фаш. акупацыі ў вёсцы быў створаны канцлагер, дзе фашысты загубілі каля 20 тыс. сав. грамадзян. Ням. фашысты спалілі вёску, загубілі 60 мірных жыхароў. У Б. 3 помнікі сав. воінам і партызанам.

БАРАВЫХ Андрэй Ягоравіч (н. 30.10.1921, Курск), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1943, 1945), ген.-палк. авіяцыі. З рабочых. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1940. Скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, Акадэмію Ген. штаба. На фронце з снеж. 1941. Удзельнік баёў за Ржэў, Таропец, Арол, Курск, Гомель, Брэст, Львоў, Варшаву, Берлін. Зрабіў 600 баявых вылетаў, асабіста збіў 32 варожыя самалёты і 14 у групавых баях. Дэп. Вярх. Савета СССР 4-га скл. Служыць у Сав. Арміі.

БАРАВЫЯ, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., каля воз. Лосвіда (1 *км*). Цэнтр Прудніцкага с/с і саўгаса «Стайкаўскі». За 4 *км* на ПдУ ад Гарадка, 34 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. ст. Залучча, каля шашы Гарадок — Віцебск (2,5 *км*). Аўтобусная ст. 227 ж., двароў 83 (1970). Аддз. сувязі, сталовая. Помнік-абеліск 300 воінам-землякам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БАРАВЫЯ ІМХІ, расліны парадку вялёных імхоў (Bryales). Маюць лістасцябловае цела. На падземнай частцы сцябла ёсць тонкія выросты (рызоіды), з дапамогай якіх мох усмоктвае ваду і растворы мінер. соляў з глебы. Б. і. пашыраны ў вільготных хваёвых лясах, утвараюць рыхлае паглебавае покрыва, праз якое лёгка пранікае вада і паветра. Асн. віды: плеўроцыум Шрэбера, хілакоміум бліскучы, дыкранум хвалісты, птыліум страусава пяро, лугавы лён. Лесаводы называюць гэтыя імхі бліскучымі за шаўкавістыя лісты, а лясы, у якіх моцна разрастаюцца Б. і., вялёнамошнікамі. Гл. іл. на ўкл. да арт. *Мохападобныя*.

БАРАГ Леў Рыгоравіч [н. 31.12.1910 (12.1.1911), Кіеў], беларускі і рускі савецкі фальклярыст і літаратуразнавец. Д-р гістар. н. (1969). Чл. КПСС з 1964. Скончыў Маскоўскі пед. ін-т імя Леніна (1930). У 1938—49 заг. кафедры і дац. Мінскага пед. ін-та і БДУ, адначасова (1938—41) ст. навук. супрацоўнік Ін-та мовы і л-ры АН БССР. Зрабіў шмат запісаў фальклору ў розных раёнах Беларусі. З 1951 дац. Башк. ун-та. Друкуецца з 1940. Аўтар прац па бел., рус. і ўкр. казкі, творчасць Я. Купалы, М. Лынькова, М. Танка, Цёткі, Да. Фанвізіна, М. Шолахава, М. Горкага, М. Гафуры, С. Агіша, А. Тагірава, Б. Бікбая і інш. Выдаў па пям. мове «Беларускія народныя казкі» (Берлін, 1—4 выд., 1966—70).

Тв.: Беларуская казка, Мн., 1969; Восточнославянские сказки, их взаимосвязи и национальное своеобразие, у кн.: Эпические жанры устного народного творчества, Уфа, 1969.

Літ.: Зарыцкі А. Беларускія казкі ідуць па свеце, «Полымя», 1968, № 2; Саламевіч І. У. (скл.) Беларускі фальклор (1926—1963). Кароткі бібліягр. даведнік, Мн., 1964; Литературоведение в Поволжье. Библиогр. указатель, Саратов, 1967.

БАРАДАТАЯ КУРАПАТКА (Perdix dauricа), птушка сям. фазанавых атр. курыных. Маса 300—325 *г*. Апярэннем нагадвае шэрую курапатку, адрозніваецца ад яе «барадой» (даўгаватае пер'е пад дзюбаю). Пашырана ва ўмераным поясе Азіі; у СССР — у паўд. і паўд.-ўсх. раёнах азіяцкай часткі. На Беларусі новы від, завезены для акліматызацыі з Тувінскай АССР. У 1959 на Міншчыне выпушчана 304, у 1960 — 1078 Б. к. Гл. іл. на ўкл. да арт. *Птушкі*.

БАРАДАЎКА Іван Міхайлавіч (н. 19.5.1925, в. Пляшыўцы Талачынскага р-на Аршанскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1956. У 1940—41 працаваў трактарыстам у калгасе «Расія» Талачынскага р-на. З 1944 трактарыст, з 1945 брыгадзір трактарнай брыгады Талачынскай МТС. З 1949 брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «XVIII партз'езд» Талачынскага р-на Віцебскай вобл.

БАРАДАЎКА Павел Рыгоравіч [10(23).1. 1908, в. Асташава Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 19.6.1968], кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. Да 1939 працаваў у калгасе. З 1939 у Чырв. Арміі. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939) і сав.-фінляндскай вайны 1939—40. На франтах Айч. вайны з 1941, наводчык мінамёта. Вызначыўся ў 1944 пры прарыве абароны ворага каля Рагачова Гомельскай вобл., фарсіраванні Друці і ўтрыманні плацдарма ў час штурму Кёнігсберга, вызваленні Кракава.

БАРАДАЎКІН Сцяпан Якаўлевіч [14(27).12. 1905, в. Спаская Ельнінскага пав. Смаленскай губ.— 8.4.1964], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. Напярэдадні Айч. вайны сакратар Ушацкага РК КП(б)Б. У пач. вайны пакінуты на акупаванай тэр., вёў масава-паліт. работу сярод насельніцтва, стварaў партыз. атрады. З крас. 1942 у партызанах: нач. штаба атрада, потым брыгады «Дубава». З 15.5.1943 сакратар Ушацкага падпольнага РК КП(б)Б, з крас. 1944 камісар *партызанскай брыгады Чашніцкай* («Дубава»). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

БАРАДЗІН Аляксандр Парфенавіч [28.9 (10.10).1848—26.3(7.4).1898], рускі інжынер і вучоны ў галіне чыгуначнага транспарту. Скончыў у Пецярбургу Тэхналаг. ін-т (1870) і Ін-т шляхоў зносін (1872), в 1874 кіраўнік Кіеўска-Брэсцкай чыгункі. У 1879—96 гал. інжынер службы рухомага саставу, цягі і майстэрняў Паўд.-Зах. чыгунак. Навук. дзейнасць Б. зрабіла ўплыў на развіццё чыг. транспарту Расіі 90-х г. Па яго праекце ў 1885 быў зроблены паравоз з машынай кампаўнд (паравая машына двайнога расшырэння). Арганізаваў першую ў свеце паравозную лабараторыю для выпрабавання паравозаў у стацыянарных умовах (1881). Рускае тэхн. т-ва заснавала залаты медаль імя Б. за вынаходствы і даследаванні ў галіне чыг. транспарту.

Літ.: Романов В. и Ткаченко Ф. Бородин Александр Парфеньевич, М., 1949.

БАРАДЗІН Аляксандр Парфіравіч [31.10 (12.11).1833, Пецярбург — 15(27).2.1887], рускі кампазітар і вучоны-хімік. Вучыўся ў Медыка-хірургічнай акадэміі (1850—56). З 1864 ардынарны праф., з 1877 акад. Медыка-хірургічнай акадэміі. У 1862 увайшоў у *«Магутную кучку»*. Паслядоўнік М. Глінкі ў стварэнні нац. эпічнай оперы (опера «Князь Ігар», незавершаная Б., скончана М. Рымскім-Корсакавым і А. Глазуновым, паст. 1890), пачынальнік рус. эпічнай сімфоніі [Першая сімфонія, 1867; Другая, т. зв. Валатоўская (Багатырская), 1876], адзін са стваральнікаў квартэтнага жанру ў рус. музыцы (два квартэты, 1879 і 1881). У аснове творчасці Б.— гераіка-патрыятычная тэма духоўнай велічы і магутнасці рус. народа. З ёю звязаны не толькі буйныя творы Б., але і некат. рамансы («Песня цёмнага лесу», «Спячая князёўна», абодва на ўласныя тэксты). Другая вобразная сфера музыкі Б.— гарманічная і светлая лірыка [адзін з найлепшых узораў — раманс «Дзеля далёкае айчыны» («Для берегов отчизны дальной») на словы А. Пушкіна]. Б. стварыў самабытны нац. стыль, які пазбаўлены фальклорных цытат, але аднаўляе карэнныя рытмаінтанацыйныя і ладавыя асаблівасці нар. муз. мовы, рысы нар. харавой поліфаніі. У стылі Б. арганічна ўвасоблены і ўсходнія нац. элементы (палавецкія сцэны ў оперы «Князь Ігар», сімф. карціна «У Сярэдняй Азіі», 1880, і інш.). Опера Б. ставілася ў Мінску (упершыню ў 1899, на сцэне Бел. т-ра оперы і балета ў 1934 і 1949). Б.— аўтар навук. прац у галіне арган. і фізіял. хіміі. Распрацаваў метад



атрымання бромазамешчаных тлустых кіслот дзеяннем брому на сярэбраныя солі к-т. Першы атрымаў фторысты бензаіл. Даследаваў полімерызацыю і кандэнсацыю альдэгідаў, вывучаў ацэтальдэгід і апісаў рэакцыю альдольнай кандэнсацыі.


Літ. тв.: Письма А. П. Бородина, в. 1—4, М.—Л., 1927—50; Музыкально - критические статьи, М.—Л., 1951.

Літ.: Сохор А. Н. Александр Порфирьевич Бородин. Жизнь, деятельность, музыкальное творчество, М.—Л., 1965; Стасов В. В. Александр Порфирьевич Бородин, М., 1954.

БАРАДЗІН Іван Парфенавіч [18(30).1. 1847, Ноўгарад — 5.3. 1930], рускі батанік. Акад. (1902). Праф. (1880). Заснавальнік Рускага батанічнага т-ва (1916) і яго нязменны старшыня. Даследаваў дыханне і апладненне раслін, хларафіл і інш. Аўтар падручніка па анатоміі раслін (1888), даведніка «Калектары і калекцыі па флоры Сібіры» (1908) і інш. Яго «Кароткі падручнік батанікі» выдаваўся 12 разоў. У некат. працах выказваў віталістычныя погляды, за гэта яго крытыкаваў К. А. Ціміразеў.

Тв.: Очерки по вопросам оплодотворения в растительном царстве, СПб., 1903; Курс анатомии растений, 5 изд., М.—Л., 1938.

БАРАДЗІН Цімафей Сцяпанавіч (жн. 1917, Гомель — 20.6.1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падпольнай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Гомелі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). Чл. КПСС з 1941. Па заданні Гомельскага гаркома КП(б)Б арганізаваў і ўзначаліў групу падпольшчыкаў, якія друкавалі і распаўсюджвалі лістоўкі, памагалі партызанам, рабілі для іх пашп. пашпарты, пячаткі, прапускі і інш. дакументы, вызвалялі з лагераў ваеннапалонных. Група Б. ўзарвала майстэрні, дзе рамантаваліся варожыя танкі, бензасховішчы, рэстаран. 9.5.1942 у час падрыхтоўкі ўзрыву Гомельскай эл. станцыі фашысты арыштавалі Б. і некалькіх яго таварышаў і расстралялі. У Гомелі на доме, дзе жыў Б., устаноўлена мемарыяльная дошка; у гарадскім парку яму пастаўлены помнік.



Літ.: Гомельчане — Герои Советского Союза. [Альбом], Гомель, 1965. *Д. М. Петрачэнка.* Мінск.

БАРАДЗІНСКАЯ БІТВА 1812, самая вялікая бітва за час Айчыннай вайны 1812 паміж рускай арміяй (132 тыс. чал., 640 гармат, камандуючы М. І. Кутузаў) і французскай (135 тыс. чал., 587 гармат, камандуючы Напалеон I) 26 жн. (7 вер.) каля с. Барадзіно, за 110 *км* на З ад Масквы.

Рускія арміі (1-я Зах., камандуючы М. Б. *Барклай дэ Толі*, 2-я Зах., камандуючы П. І. *Багратыён*) разам з рэзервамі М. А. *Міларадавіча* і 21 тыс. апалчэнцаў 22 жн. (3 вер.) прыбылі ў Барадзіно, дзе Кутузаў вырашыў даць французам генеральны бой. Правы фланг (больш за $^2/_3$ рус. войск) даходзіў да Масква-ракі, левы — да в. Уліца. Тым самым была надзейна прыкрыта Новая Смаленская дарога. Каб закончыць абарончыя работы на Курганнай вышыні (батарэя Раеўскага) і каля в. Сямёнаўскае (Багратыёнавы флешы), рус. войскі (12 тыс. чал., 36 гармат) амаль суткі стрымлівалі намнога большыя сілы ворага (40 тыс. чал., 186 гармат) у баі за Шавардзінскі рэдут. Б. б. пачаўся ў 5 *гадз* 30 *мін* наступленнем франц. войск (каля 85 тыс. чал., 400 гармат) на Багратыёнавы флешы, батарэю Раеўскага і на флангі рус. войск. Бой за Багратыёнавы флешы цягнуўся больш за 6 гадзін, і толькі апаўдні рус. войскі адступілі на ўзгорак за Сямёнаўскі яр. Дзве атакі на батарэю Раеўскага не мелі поспеху. Для трэцяй, рашаючай, французы сканцэнтравалі 35 тыс. чал. і 300 гармат. Але рус. кавалерыйскія палкі ген. Ф. П. Уварава і казакі ген. М. І. Платава, паводле загаду Кутузава, ударылі па левым фланзе ворага, што дало магчымасць рус. войскам перагрупавацца і падцягнуць падмацаванне. У 14 *гадз* пачалася 3-я атака французаў. Пасля цяжкага бою рускія вымушаны былі адступіць. На гэтым атакі французаў спыніліся. У 18 *гадз* рус. войскі адышлі на пазіцыю па лініі с. Горкі — Старая Смаленская дарога. Калі сцямнела, Напалеон адвёў свае войскі за р. Калочу. У гэтай бітве французы страцілі больш за 58 тыс. чал., у т. л. 47 генералаў; рускія — 44 тыс. чал., у т. л. 23 генералы. Вялікія страты і адсутнасць рэзерваў прымусілі Кутузава адвесці армію спачатку да Можайска, а потым за Маскву. В. б. падрыхтавала паражэнне напалеонаўскай Францыі. У В. б. ў складзе палкоў 1-й і 2-й Зах. армій удзельнічалі ўраджэнцы Віцебскай, Гродзенскай,

Мінскай губ., вызначыліся Брэсцкі і Мінскі пяхотныя палкі.

Літ.: гл. пры арт. *Айчынная вайна 1812.*

БАРАДУЛІН Рыгор Іванавіч (н. 24.2.1935, в. Гарадок Ушацкага р-на Віцебскай вобл.), беларускі савецкі паэт. З сям'і рабочага. Скончыў філал. ф-т БДУ (1959). Працаваў у газ. «Советская Белоруссия», час. «Бярозка» і «Беларусь», у выд. «Беларусь», з 1969 — у час. «Полымя». Друкуецца з 1954. Першы зб. «Маладзік над стэпам» (1959). У паэзіі Б. выявіліся лёс і духоўны свет пасляваен. пакалення, маленства якога прыпала на гады Айч. вайны; шырока разгорнута тэма Радзімы, сав. патрыятызму, любові да роднай прыроды. Вершы пра вайну, асваенне цаліны і новабудоўлі Беларусі, пра Сібір і Д. Усход, Латвію, Таджыкістан стаяць поруч з інтымнай лірыкай, творамі на гістор.-рэвалюц. тэматыку і фальклн.-песенныя матывы. Яркая метафарычнасць, каларытная мова, разнастайнасць вобразна-выяўленчых сродкаў — характэрныя адзнакі творчасці Б. Сатыр. і гумар. вершы ў зб. «Дойны конь» (1965), дзіцячыя ў зб. «Мех шэрых, мех белых» (1963), «Красавік» (1965), «Экзамен» (1969). Пераклаў «Ветрык, вей!» Я. Райніса, паасобныя творы Дж. Байрана, У. Бранеўскага, Э. Межэлайціса і інш. Вершы паэта перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжой.



Тв.: Рунець, красаваць, налівацца!, Мн., 1961; Нагбом, Мн., 1963; Неруш, Мн., 1966; Адам і Ева, Мн., 1968; Лінія перамены дат, Мн., 1969; Дзякуй роднаму слову!, у кн.: Пра час і пра слабе, Мн., 1966.

Літ.: Бяровкін Р. Спадарожніца часу, Мн., 1961, с. 263—282; Клышка А. Права на верш, Мн., 1967, с. 105—116; Сіпакоў Я. Акіян святла, «Маладосць», 1967, № 7; Арочка М. Першы паэтычны падрахунак, «Полымя», 1969, № 1; Шпакоўскі Я. Першароднасць вобразнага мыслення, «Маладосць», 1970, № 2.

А. А. Лойка. Мінск.

БАРАДУЛІН Сяргей Дзмітрыевіч (24.10. 1924, в. Лебедзі Глазаўскага пав. Вяцкай губ.— 26.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. На фронце з чэрв. 1943 — наводчык рэактыўна-мінамётнай установкі («кацюшы»). Удзельнічаў у баях на Зах., 1-м і 2-м Прыбалт. і 3-м Бел. франтах. 26.6.1944 каля в. Кажамяка Сенненскага р-на батарэя трапіла ў акружэнне. Яе разлік уступіў у няроўны бой. Паранены Б. прамой наводкай біў захопнікаў. Варожы снарад падпаліў «кацюшу», увесь разлік па-геройску загінуў.

БАРАЗОН (эльбор), штучныя крышталі нітрыду бору кубічнай мадыфікацыі. Атрымліваюць з парашку нітрыду бору (белай сажы), які мае гексаганальную рашотку. Сінтэз крышталяў ідзе ў матрыцах пры т-ры 1600—1700 °С і ціску больш за 70 тыс. *ат.* Памеры, форма і колер Б. залежаць ад тэмпературнага рэжыму і каталізатараў (барый, літый, магній). Цвёрдасць аднолькавая з алмазам, а цеплаёмістасць і цеплаправоднасць большая. Не акісляецца і не траціць цвёрдасці пры т-ры да 2000 °С (алмаз акісляецца пры 800 °С). Выкарыстоўваецца ў абразіўнай вытв. і для вырабу тэрмаўстойлівых ізалятараў. Прыродных крышталяў Б. не існуе. Работы па сінтэзе Б. вядуцца ў Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН БССР.


БАРАКАМЕРА (грэч. báros цяжар+camera пакой), герметычны рэзервуар ці памяшканне, у якім штучна зменьваецца бараметрычны ціск паветра. Бываюць Б. нізкага (вакуумныя) і высокага (кампрэсарныя) ціску, а таксама стацыянарныя і перасоўныя. У вакуумных Б. ціск зменьваюць ад атмасфернага да 10^{-9} *мм рт. сл.* і ніжэй помпамі, азотнымі пасткамі ў выглядзе колбаў, метадам распылення тытану ці ахаладжэннем экранаў вадкім азотам або геліем. Б., у якіх можна мяняць т-ру, наз. тэрмабаракамерамі. У Б. вывучаюць уплыў вышыні і зменанага газавага асяроддзя на арганізм лётчыкаў і касманаўтаў, даследуюць работу авіяц. рухавікоў, прылад.

БАРАМЗІНА Таццяна Мікалаеўна (19.12. 1919, г. Глазаў Вяцкай губ.— ліп. 1944), удзельніца баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1943; тэлефаністка, яфрэйтар. У ліп. 1944 накіравана ў тыл ворага. На маршы каля в. Пекалін Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. батальён сустрэў вялікія варожыя сілы. У час бою Б. адстрэльвалася да апошняга патрона. Захапіўшы тэлефаністку, фашысты катавалі яе, але Б. не выдала ваен. тайны. Гітлераўцы выкалалі ёй вочы і расстралялі.

БАРАМІНІ (Borromini), Бараміна (сапр. Кастэлі) Франчэска (25.9.1599, каля Кома — 3.8.1667), італьянскі архітэктар, яркі прадстаўнік барока. Вучыўся ў Мілане. Найб. значныя работы: цэрквы Сан-Карла але Куатра Фантане (з 1634, фасад 1667), Сант-Іва ала Сапіенца (1642—60), Сант-Аньезе ін Агоне (фасад, 1653—55; закончана К. Райнальдзі) і араторыя Сан Філіпа Неры (да 1650) сведчаць аб прыхільнасці Б. да крывалінейных абрысаў, фантаст. прасторавых будоў і неспакойных дынамічных завяршэнняў.

БАРАН Ціхан Максімавіч (4.4.1932, в. Байкі Пружанскага пав. Палескага ваяводства — 22.1.1944), піянер-герой, удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Збіраў зброю, звесткі для партызанаў. За сувязь з партызанамі ў снеж. 1943 зняволены ў Ваўкавыскай турме. 22.1.1944 у час расправы з жыхарамі в. *Байкі* фашысты прымушалі Б. паказаць, дзе знаходзяцца партызаны. Б. завёў ворагаў у непраходную багну, паўтарыў подзвіг І. Сусаніна. Фашысты расстралялі Б. На доме, дзе нарадзіўся і жыў Б., мемарыяльная дошка, яго імем названа піянерская арг-цыя школы ў в. Малочкі Пружанскага р-на.

Літ.: Пионеры-герои, Мн., 1968; Васілеўская Г. Малюнак на снезе, Мн., 1969.



Бароны: *1* — зубавая тыпу «зігзаг»; *2* — спружынавая; *3* — трактарная дыскавая; *4* — цяжкая трактарная з выразнымі дыскамі.

БАРАНА, сельскагаспадарчая прылада для паверхневай апрацоўкі глебы — *баранавання*. Паводле канструкцыі падзяляюцца на зубавыя, дыскавыя, спружынавыя і інш., паводле масы — на цяжкія, сярэднія і лёгкія. Зубавая Б. ўжываецца для рыхлення і выраўноўвання паверхні раллі, баранавання азімых і інш. Дыскавая — для работы на цяжкіх глебах. Спружынавая — для баранавання раскарчаваных участкаў і камяністых глебаў. Лушчэнне ржышча робіцца дыскавымі Б. ці дыскавымі лушчыльнікамі-баронамі (БД-3,4; ЛБД-4,5). Для лушчэння пад бульбу і асабліва пад агародніну ўжываюцца лёгкія дыскавыя Б. Барануюць бульбу на пясчаных і супясчаных глебах лёгкімі зубавымі Б.; на цяжкіх і задзярнелых — сярэднімі; на грабяністых пасадках — фігурнымі або шарнірнымі зубавымі Б. Зубавыя Б. тыпу «зігзаг» (напр., ЗБЗС-1,0) вырабляюцца ў Слуцку і Мазыры.

Літ.: Воронов Ю. И., Ковалев Л. Н. и Устинов А. Н. Сельскохозяйственные машины, 2 изд., М., 1968. *В. М. Даманькоў.* Мінск.

БАРАНАВА, вёска ў Квасоўскім с/с Гродзенскага р-на. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 20 *км* на ПдУ ад Гродна, каля шашы Гродна — Ваўкавыск (2 *км*). 389 ж., двароў 120 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін. Помнік У. І. Леніну.

БАРАНАВАННЕ, агратэхнічны прыём паверхневай апрацоўкі глебы і догляду сельскагаспадарчых раслін. Робіцца, каб раздрабніць і разрыхліць ворны слой, выраўнаваць узараную паверхню, разбурыць глебавую скарынку, загарнуць насенне (пры раскідной сяўбе) і мінер. ўгнаенні; пры догляде с.-г. раслін (Б. азімых, яравых, пасляўкоснае). Структурныя глебы, узараныя плугамі з перадплужнікамі, не барануюцца.

БАРАНАВІЦКАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ РАБОЧЫХ І САЛДАТ 1905, адно з узброеных выступленняў на Беларусі ў рэвалюцыю 1905—07. У Баранавічах пад кіраўніцтвам групы РСДРП 8.12.1905 пачалася паліт. стачка чыгуначнікаў. На мітынгах і дэманстрацыях з заклікам да ўзброенай барацьбы выступаў прадстаўнік Маскоўскага Савета. 9 снеж. 300 чыгуначнікаў на чале са старшынёй к-та Баранавіцкага аддзялення Усерасійскага чыг. саюза інж. М. Ляпко адмовіліся выконваць распараджэнні адміністрацыі, вывелі са строю камутатар. Спыніўся рух паяздоў. 10—11 снеж. рабочыя дэпо разам з салдатамі чыг. брыгады наладзілі масавыя мітынгі і сходы. Салдаты, схопленыя жандарамі на мітынгу, былі адбіты. 11 снеж. на месца мітынгу прыбыў ген. Арцем'еў і загадаў разысціся. Рабочыя збілі генерала, сарвалі пагоны, паламалі шашку. Афіцэры, якія суправаджалі генерала, пачалі страляць у рабочых і некалькіх чалавек параніл. Узброеныя рабочыя адказалі агнём. Для задушэння Б. в. р. і с. з Вільні 12 снеж. прыбылі пагран. войскі, 13 снеж.— карная экспедыцыя ген. Арлова. У горадзе было ўведзена ваен. становішча. Пачаліся масавыя арышты. Былі кінуты ў Віленскую турму кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі выступлення (Ляпко, Друкаў, Гайдамовіч, Мухін, Бачэўскі, Здасель і інш.). 16 снеж. салдаты чыг. батальёна зноў арганізавалі сход, вырашылі забіць ген. Арцем'ева і з «Марсельезай» прайшлі па горадзе. Яны мелі намер, пасля таго як прыбудзе падмацаванне, захапіць уладу ў свае рукі і ўтварыць у Баранавічах часовы ўрад. 31 снеж. мінскі губернатар даносіў камандуючаму войск Віленскай ваен. акругі, што паліт. перакананні большасці ніжэйшых чыноў Баранавіцкай чыг. брыгады накіраваны на звяржэнне дзярж. ладу ўсімі магчымымі сродкамі, нават са зброяй у руках.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955; Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955; Лапинский Л. П. и Лукьянов Е. П. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900—1907 гг.), Мн., 1968.

М. Я. Шкляр. Мінск.

БАРАНАВІЦКАЕ ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, злучэнне партызанскіх брыгад і атрадаў, якія змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі акупаванай Баранавіцкай вобл. Створана ў пачатку крас. 1943 паводле рашэння *Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б.* Камандзір — першы сакратар Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б ген.-м. В. Я. *Чарнышоў* (Платон). У штаб па кіраўніцтве злучэння ўваходзілі Дз. М. Армянінаў, М. Т. *Анішчык*, С. П. Шупеня, Я. Д. Гапееў, Р. А. Сідарок, Р. Дз. Румянцаў. Партыз. брыгадамі і атрадамі паўн.-зах. часткі вобласці камандаваў

сакратар падпольнага абкома партыі Ф. А. *Баранаў*.

Злучэнне ядналася 26 партыз. брыгад: Ленінскую, імя Сталіна, імя Чкалава, «За Савецкую Беларусь», імя маршала Жукава, Першамайскую, «Камсамолец», «25 гадоў БССР», імя Суворава, 1-ю Беларускую кавалерыйскую, «Уперад», 1-ю Баранавіцкую, імя Дзяржынскага, імя Чапаева, імя Кірава, імя Аляксандра Неўскага, імя Панамарэнкі, імя Шчорса, імя Варашылава, «Перамога», імя Ленінскага камсамола, імя Ракасоўскага, імя Фрунзе, імя Грызадубавай, імя Молатава, Асобага прызначэння; 8 асобна дзейных атрадаў: № 620, імя Кутузава, разведвальна-дыверсійны, імя Калініна, Спецыяльны, атрад пры абкоме КП(б)Б (каменданцкі) і інш. (гл. адпаведныя артыкулы пра партызанскія брыгады і пра партызанскія асобна дзейныя атрады). Усяго больш за 30 тыс. узброеных партызанаў.

Байцы Б. п. з. падарвалі 1476 вайск. эшалонаў ворага, больш за 25 тыс. рэек, 145 чыг. і шашэйных мастоў, сотні аўтамашын і танкаў, збілі 9 самалётаў, разбілі каля 700 гарнізонаў ворага, знішчылі каля 75 тыс. і ўзялі ў палон 22 тыс. фашыстаў. За гераізм у баях больш як 2500 партызанаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Званне Героя Сав. Саюза прысвоена К. П. *Арлоўскаму*, Б. А. *Булату*, Ф. М. *Сінічкіну*, У. З. *Царуку*, В. Я. *Чарнышову*.

В. Я. Чарнышоў. Масква.

БАРАНАВІЦКА-СЛОНІМСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944, наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Беларускага фронту (камандуючы ген. арміі К. К. *Ракасоўскі*) 5—16.7.1944, састаўная частка *Беларускай аперацыі 1944* супраць ням.-фаш. войск. У Б.-С. а. ўдзельнічалі 28-я, 48-я, 65-я арміі (камандуючыя ген.-л. А. А. *Лучынскі*, ген.-л. П. Л. Раманенка, ген.-палк. П. І. *Батаў*), конна-механізаваная група (ген.-л. І. А. *Плі-еў*), 1-ы асобны гвардз. Данскі танкавы корпус (ген.-м. танкавых войск М. Ф. Паноў) і 16-я паветр. армія (ген.-палк. авіяцыі С. І. *Рудэнка*). Сав. войскі наступалі з рубяжа Данілавічы, Уза, Нясвіж, Клецк у напрамку Баранавічы, Слонім, Пружаны. Ням.-фаш. камандаванне, апіраючыся на прыродны рубеж па р. Шчара і сістэму ўмацаванняў, спрабавала затрымаць сав. войскі ў баранавіцкім умацаваным раёне. Найб. упартыя баі разгарнуліся за Баранавічы, куды праціўнік перакінуў 3 дывізіі з інш. участкаў фронту. Пасля цяжкіх двухдзённых баёў сав. войскі ўдарамі з У, Пн і Пд раніцай 8.7.1944 вызвалілі Баранавічы. Паспяхова адбіваючы контратакі рэзерваў праціўніка, сав. войскі імкліва наступалі на захад і 10 ліп. вызвалілі Слонім. 16.7.1944 войскі 1-га Бел. фронту выйшлі на рубеж Свіслач, Поразава, Пружаны; абышлі з правага боку пінскую групоўку ням. войск і стварылі пагрозу акружэння Брэста (карту гл. на ўкл.). У выніку Б.-С. а. стварыліся спрыяльныя ўмовы для шырокага наступлення да р. Віслы. Сав. войскам вельмі памаглі бел. партызаны Баранавіцкага і Мінскага злучэнняў. 28 вайсковым часцям і злучэнням, якія вызначыліся ў аперацыі, былі прысвоены ганаровыя найменні «Баранавіцкія» і 11 — «Слонімскія».

Літ.: Гл. пры арт. *Беларуская аперацыя 1944*.

Р. М. Шавэла. Мінск.

БАРАНАВІЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ, вобласць у БССР, якая існавала з 4.12.1939 да 8.1.1954. Цэнтр — г. Баранавічы. У склад Б. в. ўваходзіла 15 раёнаў (1954): Быценскі, Гарадзішчанскі, Дзятлаўскі, Іванецкі, Казлоўшчынскі, Карэліцкі, Клецкі, Любчанскі, Ляхавіцкі, Мірскі, Навагрудскі, Навамышскі, Нясвіжскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі; 7 гарадоў, 8 гар. пасёлкаў, 215 сельсаветаў. Межавала з Маладзечанскай, Мінскай, Бабруйскай, Пінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абл. Тэр. 13,7 тыс. км². У 1921—39 тэр. Б. в. ўваходзіла ў склад бурж. Польшчы. Гаспадарка амаль не развівалася, колькасць рабочых скарачалася. З-за адсутнасці рынку збыту на Слонімшчыне знікла вытворчасць шаўковай пражы, коўдраў, шарсцяных хустак. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР у Б. в. пачалі хутка развівацца харчовая, лясная і лёгкая прамысл. Было ліквідавана памешчыцкае і асадніцкае землеўладанне. Пачалася калектывізацыя с. гасп., ва ўсіх раёнах былі створаны МТС. У Айч. вайну Б. в. з чэрв. 1941 да ліп. 1944 была акупавана гітлераўцамі. На тэр. вобласці супраць захопнікаў змагалася больш за 30 партыз. брыгад (гл. *Баранавіцкае партызанскае злучэнне*). Барацьбу супраць ням.-фаш. захопнікаў узначальвалі *Баранавіцкі падпольны абком КП(б)Б*, *Баранавіцкі акруговы антыфашысцкі камітэт*, Баранавіцкае партызанскае злучэнне. Большая частка Б. в. вызвалена войскамі 1-га Бел. фронту (гл. *Баранавіцка-Слонімская аперацыя 1944*). За час акупацыі ням. фашысты загубілі 269 586 жыхароў вобласці і сав. ваеннапалонных; вывезлі на катаржныя работы ў Германію 33 773 чал. Яны разбурылі, спалілі і разрабавалі 162 будынкі прамысл. прызначэння, больш за 1100 адзінак тэхналагічнага абсталявання і 2 чыг. ст., больш за 5 тыс. камунальных і 15 210 жылых дамоў, 7 дзярж. б-к, 192 школы, тэатр, краязнаўчы музей у Слоніме, 24 851 жывёлагадоўчы двор, 34 140 с.-г. машын, 110 838 галоў буйной раг. жывёлы, свіней, авечак, коней. Калгасам прычынены страты на суму 477 056 000 руб. У пасляваенныя гады Б. в. дамаглася значных поспехаў у аднаўленні гасп. Валавая прадукцыя прамысл. ў 1949 перавысіла даваенны ўзровень на 77,5%; пабудаваны 24 цепла- і гідраэлектрастанцыі, маторарамонтны, рамонтна-механічны з-ды; адноўлены і рэканструяваны лесапільныя з-ды, гута «Нёман», папяровая ф-ка, мэблевыя і лесахімічныя прадпр., мясакамбінат, з-ды буд. дэталяў і спіртзаводы. У Навагрудку, Баранавічах, Слоніме створаны швейная, абутковая, трыкатажная, суконная ф-кі; у Ляхавічах наладжаны выпуск садова-агародніных кансерваў; адноўлены ўсе калгасы, МТС. У сельскай мясцовасці пабудавана 18,2 тыс. жылых дамоў; пашырыліся пасяўныя плошчы, павысілася ўраджайнасць збожжавых і бульбы, выраслa пагалоўе жывёлы. За поспехі ў развіцці с. гасп. 160 калгаснікаў і рабочых саўгасаў вобласці ўзнаг. ордэнамі і медалямі СССР, 7 чал. прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1950 у Б. в. было 689 пач. школ, 202 сямігадовыя, 52 сярэднія, у т. л. 911 беларускіх. У іх навучалася 113 тыс. дзяцей. У вобласці было 18 дзіцячых садоў, 26 дзіцячых дамоў, 2 школы ФЗН, 3 рамесн. вуч., 8 сярэд. спец. навуч. устаноў, пастаўніцкі ін-т і ін-т удасканалення настаўнікаў; 60 раённых і сельскіх Дамоў культуры, 230 хат-чытальняў і сельскіх клубаў, 599 чырв. куткоў, 1023 б-кі, абласны і раённы (у Слоніме) Дамы піянераў, дзіцячая тэхн. станцыя ў Нясвіжы, 2 станцыі юных натуралістаў, 3 юнацкія спарт. школы, школа-інтэрнат. Выдавалася абласная і 15 раённых газет. Пасля ліквідацыі Б. в. Дзятлаўскі, Казлоўшчынскі, Карэліцкі, Любчанскі, Мірскі, Навагрудскі, Слонімскі р-ны ўключаны ў склад Гродзенскай вобл.; Клецкі, Нясвіжскі, Стаўбцоўскі — Мінскай; Іванецкі — Маладзечанскай; Быценскі, Гарадзішчанскі, Ляхавіцкі, Навамышскі — Брэсцкай. *Ю. П. Афоніч*. Мінск.

БАРАНАВІЦКАЯ РАЎНІНА, на Пн Брэсцкай вобл. Вылучаецца як фіз.-геагр. раён Заходнебеларускай правінцыі. Плоска-хвалістая паверхня з выш. 150—200 *м*, нахілёная ад Навагрудскага ўзв. ў бок Палесся і даліны сярэдняга цячэння Шчары. Далiны рэк урэзаны на глыб. не больш як 10—15 *м*. На Пд паблізу Шчары ўчасткі з дзюнна-ўзгорыстым рэльефам. Ад Палесся Б. р. аддзяляецца перарывістай палосай невял. марэнных узгоркаў і град. Складзена з водналедавіковых пяскоў і супескаў з участкамі донай мараны. Карысныя выкапні: цагельна-чарапічныя гліны, баластавыя пяскі, торф, мел і мергель. Б. р. арашаецца Шчарай і яе прытокамі (Мышанкай, Грыўдай і інш.). Глебы дзярнова-падзолістыя пылавата-супескавыя і пясчаныя. На марэнных участках дзярнова-падзолістыя лёгкасугліністыя, а ў паніжэннях і далінах — тарфяна-балотныя. Пад лесам больш за 1/3 тэр. Пераважаюць бары і субары з прымессю шыракалістых парод. Драбналістыя (чорнаалешнік і інш.) на Пд, у забалочанай частцы раўніны. Там пазінныя, радзей пераходныя балоты. У далінах забалочаныя асаковыя і асакова-злакавыя лугі. Пад ворнымі землямі 1/3 тэр., сенажаццю і пашай 1/5. *В. А. Дзяменцьеў*. Мінск.

БАРАНАВІЦКІ АКРУГОВЫ АНТЫФАШЫСЦКІ КАМІТЭТ, падпольная патрыятычная арганізацыя, якая дзейнічала ў гады Айч. вайны на акупаванай тэрыторыі Баранавіцкай вобл. і Скідальскага р-на Беластоцкай вобл. Кіраваў работай Васілішкаўскага, Шчучынскага, Радунскага, Скідальскага (да лета 1943) раённых антыфаш. к-таў і міжраённага антыфаш. к-та польскіх патрыётаў. Створаны 5.5.1942 на канферэнцыі кіраўнікоў антыфаш. груп. У склад камітэта ўваходзілі: лейтэнант Г. М. Картухін (старшыня), былы чл. КПЗБ А. Ф. Манковіч (нам. старшыні), чл. КПСС А. А. Патапаў (сакратар), былы чл. КПЗБ П. В. Жукоўскі і Б. І. Гардзейчык (з сак. 1943 кіраўнік Б. а. а. к.), лейтэнант А. І. Іваноў. Члены к-та адначасова былі і кіраўнікамі груп, аб'яднаных у партыз. атрад (камандзір Картухін). Пазней па базе гэтага атрада вырасла *партызанская брыгада імя Ленінскага камсамола*. 741 антыфаш. арганізацыя і група (каля 3600 чал.), якімі кіраваў Б. а. а. к., вялі масава-паліт. работу сярод насельніцтва і мабілізоўвалі яго на актыўную барацьбу з акупантамі, друкавалі і распаўсюджвалі лістоўкі, перадавалі партызанам звесткі разведкі, знішчалі гітлераўцаў, рабілі дыверсіі. З партызанамі падпольшчыкі ўдзельнічалі ў разгроме 22 с.-г. маёнткаў гітлераўцаў, фаш. гарнізонаў у мяст. Азёры, б. пагранічнай заставе ў Кобраўцах Скідальскага р-на і інш. З лета — восені 1943 антыфаш. арганізацыі і групы дзейнічалі пад кіраўніцтвам падпольных райкомаў КП(б)Б.

А. А. Фактаровіч. Мінск.

БАРАНАВІЦКІ БАВАЎНЯНЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства лёгкай прамысловасці. Асн. прадукцыя: баваўняная пража, суравая тканіна, у т. л. міткаль, фланель, сацін, бязь і пятканыя матэрыялы — вацін для швейных і мэблевых прадпр., тэхн. сурвэтка, аснова пад штучную скуру і інш. Буд-ва камбіната пачалося ў 1960. У 1964 здадзена ў эксплуатацыю першая прадзільная ф-ка магутнасцю 111 тыс. прадзільных і 17 тыс. круцільных верацён, у 1965 — другая на 132 тыс. верацён, у 1966 — ткацкая ф-ка на 3890 станкоў, у снеж. 1967 — 1-я, у снеж. 1968 — 2-я чарга аддзелачнай вытворчасці адпаведна на 25 млн. і на 20 млн. *м* гатовай тканіны, у вер. 1969 — апошні пускавы комплекс аддзелачнай вытворчасці на 20,3 млн. *м* гатовай тканіны. У 1964 выраблена пражы 5,2 тыс. *т*, пятканых матэрыялаў 1447 тыс. *м*, у 1969 адпаведна 22,2 тыс. *т* і 6,3 млн. *м*, суравой тканіны 94,9 млн. *м*, гатовай тканіны 56,2 млн. *м*. Пры камбінаце дзіцячая музычная студыя, 10 калектываў мастацкай самадзейнасці (ансамбль «Юнацтва» — лаўрэат Усесаюзнага агляду самадзейнага мастацтва, выступаў у Польшчы, Балгарыі), дзіцячыя сады-яслі. Іл. гл. на ўкл. *Брэсцкая вобласць*.

Літ.: Просвирнина А. Н. (сост.). Опыт работы Барановичского хлопчатобумажного комбината, М., 1966. *З. В. Капкова*. Баранавічы.

БАРАНАВІЦКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ запальны. Заснаваны ў 1952 як абласны краязнаўчы музей часткова на базе Слонімскага гісторыка-краязнаўчага музея. Адкрыты 23.2.1953. Перайменаваны ў Б. к. м. 9.4.1954. У фондах і 9 экспазіцыйных залах музея (пл. 460 м²) каля 13 тыс. экспанатаў. З аддзелы: прырода краю, гісторыя дасавецкага і сав. перыядаў. У аддзеле гісторыі дасавецкага перыяду матэрыялы пра найб. важныя падзеі ў Баранавічах і навакольлі, у т. л. пра рэвалюц. падзеі 1905 (гл. *Баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905*) і 1-ю сусв. вайну. У аддзеле гісторыі сав. перыяду матэрыялы пра Кастр. рэвалюцыю і грамадз. вайну, барацьбу працоўных Зах. Беларусі на чале з КПЗБ у гады акупацыі краю бурж. Польшчай, пра вызв. паход Чырв. Арміі ў вер. 1939, Вял. Айч. вайну, пасляваен. сацыяліст. будаўніцтва. Сярод экспанатаў — дакументы, фотаздымкі, асабі-

стыл рэчы, успаміны ўдзельнікаў Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны, матэрыялы пра падпольную дзейнасць Слонімска-Баранавіцкага акруговага к-та КПЗБ, пра ўдзел В. З. *Харужай* у стварэнні падпольных камсамольскіх арг-цый у Баранавічах і інш. Шырока адлюстравана ў экспазіцыі тэма Вял. Айч. вайны, у т. л. партыз. рух на тэр. б. Баранавіцкай вобл. (гл. *Баранавіцкае партызанскае злучэнне*), дзейнасць *Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б, Баранавіцкага акруговага антыфашысцкага камітэта*; злачынствы ням.-фаш. акупантаў (дыярама *Калдычэўскага лагера смерці*), вызваленне Сав. Арміяй тэр. б. Баранавіцкай вобл. ў выніку *Баранавіцка-Слонімскай аперацыі 1944*. На стэндзе «Герої-землякі» дакумент. матэрыялы пра С. І. *Грыцаўца*, Г. М. *Хасцялкова*, У. З. *Царука* і інш. У раздзеле паслявае. сацыяліст. будаўніцтва ўзоры прадукцыі пар. гасп. У 1969 музей наведала больш за 83 тыс. чал.

В. А. Вайтовіч, Р. А. Душкіна. Баранавічы.

БАРАНАВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ АБКОМ КП(б)Б у гады Вялікай Айчыннай вайны, цэнтр кіраўніцтва партыйным падполлем і партызанскім рухам на тэрыторыі Баранавіцкай вобл. ў час нямецка-фашысцкай акупацыі. Створаны паводле рашэння ЦК КП(б)Б у снеж. 1942, распачаў дзейнасць па акупаванай тэр. ў сак. 1943. Сакратары В. Я. *Чарнышоў* і Ф. А. *Баранаў* (з жн. 1943, узначальваў паўд. групу раёнаў); члены бюро абкома: Дз. М. Армяніпаў, Я. Д. Гапеёў, Р. Дз. Румянцаў, Р. А. Сідарок, Р. А. Старавойценка, У. З. *Царук*, С. П. Шупеня. Друкаваны орган газ. «Чырвоная ўлада» (28.4.1943—4.7.1944, перыядычнасць 7—8 разоў за месяц, тыраж 2—2,5 тыс. экз., рэд. Р. А. Старавойценка, з сак. 1944 Г. В. *Будай*). Размяшчаўся ў Налібоцкай пушчы. За час дзейнасці стварыў 6 падпольных міжрайкомаў (гл. *Міжраённыя падпольныя камітэты КП(б)В*), падпольныя Баранавіцкі гарком, Лідскі гаррайком і 23 райкомы КП(б)Б (гл. *Раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б*), якія аб'ядноўвалі 143 пярвічныя партарганізацыі, 2314 камуністаў, з іх 1432 прыняты ў партыю ва ўмовах падполля. 22 райкомы выдавалі газеты. Пад кіраўніцтвам Б. п. а. КП(б)Б дзейнічаў Баранавіцкі падпольны абком ЛКСМБ (крас. 1943 — ліп. 1944, сакратары А. К. Рыбакоў і Ф. А. Башкінцаў, па паўд. групе раёнаў упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ П. С. Пятроўскі), падпольныя Івянецкі, Лідскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі, Шчучынскі міжрайкомы, Баранавіцкі гарком і 26 райкомаў ЛКСМБ, якія аб'ядноўвалі 384 пярвічныя камсамольскія арг-цыі, 3563 камсамольцаў. Абком ЛКСМБ выдаваў газ. «Молодой мститель» (снеж. 1943 — чэрв. 1944, перыядычнасць 5—6 разоў за м-ц, тыраж 1—1,5 тыс. экз., рэд. Р. І. Гужавін). Падпольны абком кіраўніцтвам дзейнасць *Баранавіцкага партызанскага злучэння, Баранавіцкага акруговага антыфашысцкага камітэта.*


Г. В. Будай. Мінск.


БАРАНАВІЦКІ РАЁН (да 1957 Навамышскі), у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940, размешчаны на Пн вобл. Пл. 2,2 тыс. км². Нас. 162,6 тыс. чал. (з Баранавічамі, 1969). Падзяляецца на 22 сельсаветы; г. п. Гарадзішча. Цэнтр г. Баранавічы.

Большая частка раёна раўнінная, на ПнЗ адгор'і Навагрудскага ўзвышша (выш. да 267 *м*), на У — Капыльскай грады. Карысныя выкапні: 4 радовішчы торфу — 18,4 млн. *т* (Торбалава — 6,3 млн. *т*, Моўчадзь і Падлясейкі па 4 млн. *т*), 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 56,4 млн. *м*³ (Пастарынне 46,3 млн. *м*³, Люшнева 9,9 млн. *м*³), 6 радовішчаў буд. пяскоў — 232,4 млн. *м*³ (Нова-Польня 108,6 млн. *м*³, Тартак 70,6 млн. *м*³), 3 радовішчы цагельных глінаў — 0,2 млн. *м*³ (Зубаўшчына каля в. Данейкі 0,13 млн. *м*³). Сярэдняя т-ра студз. ад —6 да —6,5, ліп. 18—18,5 °С. Ападкаў 630 *мм* за год. Вегет. перыяд 195 дзён. Рэк і азёраў мала. На схілах Навагрудскага ўзвышша пачынаюцца і цякуць з Пн на Пд р. Шчара з прытокам Мышанка. На ПдЗ невялікае воз. Гаць. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (66,1%), дзярнова-падзолістыя часова залішне ўвільготненыя (13,1%), тарфяна-балотныя (10,2%), дзярнова-глеевыя (7,2%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (3,4%). З мінер. глебаў 26,7% сугліністых, 65,1 супясчаных, 8,2% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 45 (цана бала 0,25 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 22, усіх с.-г. угоддзяў 40. Пад лесам каля 30% тэр. Пераважаюць хвойныя, гал. ч. хвоя. Асн. лясныя масівы на Пд раёна. Насяляюць раён беларусы (87%), ёсць палякі, рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 74 чал. на 1 км², сельскага 32 чал. на 1 км².

За гады Сав. улады створаны прадпрыемствы маш.-буд., буд. м., лёгкай і харч. прамысловасці (гл. *Баранавічы*). На ПнЗ ад Баранавіч вял. торфапрадпр. «Каўпеніца». 2 раённыя аб'яднанні Сельгастэхнікі (Баранавічы, Арабаўшчына). Прадпрыемствы для перапрацоўкі с.-г. сыравіны (спіртзаводы ў Вольнай і Ястрабелі, вінзавод у Вольнай), вытв. цэглы, парыхтоўкі і апрацоўкі драўніны. Будуецца (1970) буйная птушкафабрыка ў Русіне. У раёне 22 калгасы, 15 саўгасаў, эксперымент. база, птушкафабрыка (1970).

Торфапрадпрыемства «Каўпеніца».






Стагаванне сена ў калгасе «Прагрэс».

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» (*Карчова*), «Дружба» (*Падлясейкі*), імя Вільчкоўскага (*Малая Сваротва*), імя Дзяржынскага (*Міляевіды*), «Зара» (*Падгорная*), «Зара камунізма» (*Моўчадзь*), «Кастрычнік» (*Пастарынне*), імя Кірава (*Лайрынавічы*), імя Леніна (*Свіраны*), «Ленінец» (*Зялёная*), імя Мічурына (*Малая Каўпеніца*), «Новы шлях» (*Сталавічы*), «Перамога» (*Крошын*), «Пераможца» (*Гірмантаўцы*), «Прагрэс» (*Вялікае Сяло*), «Праца» (*Нагорная*), «Савецкая Радзіма» (*Скробава*), «Світанне» (*Новая Мыш*), «17 верасня» (*Перхавічы*), «40 гадоў Кастрычніка» (*Гута*), імя Чапаева (*Паланэчка*), «Шлях Леніна» (*Стайкі*). Саўгасы і іх цэнтры: «Вялікалуцкі» (*Вялікія Лукі*), «Гарадзішчанскі» (*Петкавічы*), «Іскра» (*Забалацце*), «Лотвіцкі» (*Лотвічы*), «Маяк» (*Застарынне*), «Мір» (*Прыазёрная*), «Палонка» (*Палонка*), «Почапаўскі» (*Почапава*), «1 Мая» (*Цешаўля*), «Праўда» (*Люшнева*), «50 гадоў БССР» (*Калдычэва*), «Савіцкі» (*Савічы*), «Уцёс» (*Уцёс*), «Цяплівады» (*Цяплівады*), «Чырвоны сцяг» (*Мірны*). Эксперымент. база Пружанскай абласной доследнай с.-г. станцыі «Вольна-Чорніхава» (*Вольна*), Гарадзішчанская птушкафабрыка (пас. *Савецкі*).

С.-г. ўгоддзі займаюць 51,6% зямельнага фонду раёна. Зямель з асушальнай сеткай 9,3 тыс. *га* (1.1.1970). Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) склала 87,4, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі (азімае жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка і інш.) 42,5, тэхнічнымі (лён, цукр. буракі) 4,9, бульбай 12,5, пад кармавымі 26,5. Гадоўля буйн. раг. жывёлы малочна-мяснога кірунку, свіней. Авечкагадоўля мае падсобнае значэнне. У 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 63,2, у т. л. кароў 33; свіней 42,6, авечак і коз 9,5. У раёне добра развіты чыгуначны і аўтамаб. транспарт. Праходзяць чыг. Масква — Брэст, Вільнюс — Луніпец, Магілёў — Ваўкавыск; шаша Масква — Брэст з адгалінаваннямі на Навагрудак, Слонім, Ляхавічы.

На пач. 1970 у раёне (без Баранавіч) 21 сярэдняя, 33 васьмігадовыя, 74 пачатковыя школы; 2 школы рабочай і сельскай моладзі, дзіцячая спарт. школа, 10 дашкольных устаноў, 56 клубаў, 89 б-к, 81 кінаўстаноўка (у т. л. 70 стацыянарных), паліклініка, 8 бальніц, 36 фельч.-ак. пунктаў. У 1970 у раёне было 884 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 66 інжынераў, 62 аграномы, 559 настаўнікаў, 49 урачоў; 1162 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Газ. «Знамя коммунизма» (раённая і гарадская).

І. І. Трухан. Мінск.



БАРАНАВІЦКІ РУСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР. Створаны ў пач. 1940 на аснове *Рагачоўскага калгасна-саўгаснага тэатра.* Маст. кіраўнік А. Лізункоў. Акцёры: М. Васілеўскі, Я. Гаробчанка, Я. Мазуранка, Б. Савіч, Г. Свірчэўскі, Н. Шкалярэнка і інш. Спектаклі: «Любоў Яравая» К. Транёва, «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Рэвізор» М. Гогаля, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «У пушчах Палесся» Я. Коласа. У 1941 т-р спыніў дзейнасць, адпавіў ле ў 1944. Маст. кіраўнік Я. Танальскі. У рэпертуары: «Жыццё вучыць» В. Галаўчынера, «Мілы чалавек» К. Крапівы, «Мяшчане» М. Горкага, «Платон Крэчат» А. Карнейчука. У 1948 т-р расфарміраваны.

БАРАНАВІЧЫ, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Вял. чыг. вузел (6 напрамкаў). Аэрапорт. У 1905 — 1,5 тыс. ж., у 1939 — 27 тыс., у 1959 — 58 тыс., у 1970 — 102 тыс. ж.

Да 1872 невялікае мястэчка, якое пачало развівацца в буд-вам чыгунак Брэст — Варшава (1872), Вільня — Роў-



Баранавічы. Вул. Міцкевіча. 1933.

на (1880). У 1904 гурток РСДРП баранавіцкіх чыгуначнікаў падтрымліваў сувязь з Вільняй, Рыгай, Пецярбургам, Жэневай. У Б. адбылося *баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905*. У пач. імперыялісц. вайны ў горадзе знаходзілася Стаўка вярхоўнага гал. камандавання рус. арміі. У сярэдзіне 1915 акупаваны кайзераўскімі войскамі. У 1-ю сусв. і сав.-польскую войны ў Б. адбываліся жорсткія баі. Паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* горад адышоў да бурж. Польшчы, у складзе якой быў да ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР (1939). У 1922—39 павятовы цэнтр Навагрудскага ваяводства. Пэўны час тут размяшчаўся Слонімска-Баранавіцкі акруговы к-т КПЗБ. У 1939—54 цэнтр *Баранавіцкай вобласці*. З 27.6.1941 да 8.7.1944 акупаваны ням. фашыстамі, якія зруйнавалі горад (страты 132 818 тыс. руб.).

Б.— адзін з буйных прамысловых і культ. цэнтраў рэспублікі. У 1969 было больш за 40 прамысл. прадпрыемстваў. Лёгкая прамысл.: *Баранавіцкі бавоўняны камбінат*, побач з камбінатам гарадок тэкстыльшчыкаў; швейная, трыкатажная і абутковая ф-кі. З-д жалезабетонных вырабаў, камбінат зборнага жалезабетону, з-д буддэталяў. Важны цэнтр машынабудавання. На базе матарамонтнага створаны з-д аўтамаб. агрэгатаў (дамкраты, амартызатары, рулявыя кіраванні, прывадныя шківы і інш.). З-ды: станка-прылад (тэхналаг. аснастка да металарэзных станкоў: паваротныя сталы з мех. і ручным прыводам, пнеўматычныя і гідраўлічныя ціскі), гандлёвага машынабудавання (вентылятары, магутныя мясарубкі, машыны для перапрацоўкі агародніны і інш.). Каля $^1/_3$ прадукцыі горада даюць прадпр. харч. прамысловасці: мясакансервавы і млынавы к-ты, малочны і піваварны з-ды. Слупапрапітны


Баранавічы. Цэнтральная плошча.



з-д (апоры для ліній электраперадач), ф-ка маст. вырабаў (сувеніры), мэблевая ф-ка, прадпр. мясцовай прамысл. па выпуску тавараў шырокага ўжытку.

У мінулым Б.— горад з малапавярховымі дамамі. Новае буд-ва, якое ажыццяўляецца паводле ген. плана 1967, істотна змяніла аблічча горада. Створаны агульнагарадскі цэнтр і гал. плошча. Асн. магістралі — вул. Леніна, Савецкая, Камсамольская, Чарнышэўскага — забудоўваюцца шматпавярховымі дамамі. Хуткі рост горада абумоўлены развіццём прамысловасці. У 1939 жылы фонд складаў 45 тыс. $м^2$, а ў 1968 — 570 тыс. $м^2$. Праведзены работы па добраўпарадкаванні і азеляненні Б.

У 1970 у Б. было 15 сярэдніх (у т. л. школа-інтэрнат), васьмігадовая, 4 школы рабочай моладзі, 1 завочная сярэдняя школа, 40 дашкольных установ, спарт. комплекс, 2 дзі-



Баранавічы. Палескі вакзал.

цячыя і маладзёжная спарт. школы, муз. школа, Дом піянераў; 2 прафесіян.-тэхн. вуч., дарожная тэхн. школа; тэхнікумы тэхнал. і лёгкай прамысл., мед. і муз. вучылішчы, 8 клубных устаноў, 4 масавыя б-кі, 3 кінатэатры, нар. тэатр гарадскога Дома культуры, нар. ансамбль танца Баранавіцкага клуба чыгуначнікаў, *Баранавіцкі краязнаўчы музей*. У 1940—41 і 1944—48 дзейнічаў *Баранавіцкі рускі драматычны тэатр*. З бальніцы, 5 паліклінік, 5 дыспансераў, радзільны дом (1970). Помнікі: У. І. Леніну (1960); двойчы Герою Сав. Саюза С. І. Грыцаўцу (скульптар З. Азгур, 1946). У Пакроўскім саборы зберагаюцца мазаічныя кампазіцыі, створаныя па эскізах рус. мастакоў В. Васняцова, А. Рабушкіна і інш.

Літ.: Наша республика, Мн., 1968, с. 109; Жучкевич В. А., Малышев А. Я. и Рогозин Н. Е. Города и села Белорусской ССР, Мн., 1959; Богданович А. В. и Сидоров П. А. Города Белоруссии, Мн., 1967; Бородина В. П. Промышленность Белорусского Полесья, Мн., 1968.

І. І. Трухан. Мінск.

БАРАНАВІЧЫ, вёска ў Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і калгаса «Баранавічы». За

4 *км* на З ад Гродна, 9 *км* ад чыг. ст. Ласосна, 6 *км* ад прыстані Гродна на Нёмане, каля шашы Гродна — в. Галынка (100 *м*) і Гродна — Сапоцкіна (1 *км*). 232 ж., двароў 61 (1970). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт.

БАРАНАВЫХ (сапр. Баранаў) Сымон Якаўлевіч (1.9.1900, в. Рудкова Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 10.11.1942), беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Скончыў БДУ (1931). Друкавацца пачаў у 1927. У першым зб. апавяданняў «Злосць» (1930) — сцэны жыцця і побыту бел. дакастр. вёскі, эпізоды грамада. вайны і польскай інтэрвенцыі. У аповесцях «Чужая зямля» (1930), «Межы» (1929—30), «Новая дарога» (1936) перадае атмасферу класавай барацьбы ў бел. вёсцы ў першыя гады Сав. улады і ў час калектывізацыі, паказвае працэс карэннай ломкі старога побыту, уласніцкай псіхалогіі селяніна, узнікненне сацыяліст. нормаў жыцця. Напісаў прыгодніцкую аповесць для дзяцей «Пастка» (1934), раман «Калі ўзыходзіла сонца» (1935—36, апубл. 1957). Перакладаў на бел. мову творы М. Горкага.



Тв.: Калі ўзыходзіла сонца (уступны арт. Я. Казекі), Мн., 1957; Пастка, Мн., 1958; Дзве аповесці (уступны арт. М. Яроша), Мн., 1967.

Літ.: Пальчэўскі А. Былі ў маці сыны, Мн., 1968, с. 228—238; Голубева Л. Дзве аповесці Сымона Баранавых, «Полымя», 1968, № 1.

БАРАНАЎ Ермалай Максімавіч (ліп. 1892, мяст. Кайкава Мінскага пав.— 1942), удзельнік партыйнага падполля ў гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі, Вял. Айч. вайны. З сялян. Чл. КПСС з 1919. У 1906—14 парабкаваў, працаваў чорнарабочым у Мінску, Рамнах, Баранавічах. У 1914—17 служыў у арміі. З вясны 1918 па даручэнні Мінскага падпольнага райкома РКП(б) быў старшынёй Кайкаўскага падпольнага падрайкома, начальнікам партыз. атрадаў. З 1919 да 1923 у Чырв. Арміі, потым на сав. і гасп. рабоце. У Айч. вайну адзін з арганізатараў *Мінскага партыйна-патрыятычнага падполля:* распрацоўваў яго структуру, наладжваў сувязь з партыз. атрадамі. Летам 1942 нам. нач. зоны ў Варашылаўскім р-не Мінска. Схоплены фашыстамі 7.10.1942 і ў хуткім часе закатаваны.



В. С. Давыдава. Мінск.

БАРАНАЎ Мікалай Юльянавіч [н. 6(19).12. 1915, мяст. Пясочнае Слуцкага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыўшы 3-і курс заатэхнікума, добраахвотна пайшоў у Чырв. Армію (1935). У 1939 скончыў артыл. вучылішча. Удзельнічаў у баях з фашыстамі пад Вязьмай (1941). З 19.5.1942 у партыз. атрадзе імя Катоўскага, з кастр. 1942 камандзір гэтага атрада, з 31.11.1943 камандзір *партызанскай брыгады № 200* імя К. К. Ракасоўскага Мінскай вобл. У 1948 Б. скончыў Рэспубліканскую парт. школу. З 1964 нам. міністра харчовай прамысловасці БССР. Узнагароджаны 4 ордэнамі, медалямі.

БАРАНАЎ Міхаіл Паўлавіч (н. 1904, с. Аляксандраўскае Сургуцкага пав. Табольскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся каля Камарына Палескай вобл. Адзін з першых фарсіраваў Дняпро, выбіў ворага з траншэі, замацаваўся на плацдарме. Жыве на радзіме.

БАРАНАЎ Уладзімір Пятровіч (н. 5.10.1919, с. Стрыхаўцы Праскураўскага пав. Падольскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1954. На фронце з чэрв. 1941. Вызначыўся ў вер. 1943 каля Лоева Гомельскай вобл. Рота пад камандаваннем Б. першая пераправілася на вастраў каля правага берага Дняпра, выбіла ворага з пазіцый, забяспечыла пераправу інш. падраздзяленняў палка. Жыве ў Хмяльніцкай вобл.


БАРАНАЎ Фёдар Аляксеевіч [н. 27.12.1904 (9.1.1905), Пецярбург], савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. Чл. КПСС з 1928. У 1920—31 рабочы. З 1931 на парт. рабоце ў Ленінградзе. У 1939—40 слухач Вышэйшай школы парт. арганізатараў пры ЦК ВКП(б). У 1940—42 сакратар Баранавіцкага абкома КП(б)Б, у 1942—43 упаўнаважаны ЦК ВКП(б) па ўводзе энергамагутнасцей Урала. Са жн. 1943 сакратар *Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б*, камандаваў паўд. групай брыгад *Баранавіцкага партызанскага злучэння*. Пасля вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. акупантаў сакратар Баранавіцкага, з канца 1944 першы сакратар Бабруйскага абкомаў КП(б)Б. У 1953—58 першы сакратар Гродзенскага абкома КПБ. З 1958 старшыня Камісіі сав. кантролю Савета Міністраў БССР, Камісіі дзярж. кантролю Савета Міністраў БССР. З 1963 чл. Партказмісіі пры ЦК КПБ. На XIX, XXI, XXII, XXIV, XXV з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 4—5-га і Вярх. Савета БССР 2—4-га скліканняў. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

БАРАНАЎСКАС (Baranauskas) Антанас (17.1.1835, г. Анікшчай — 26.11.1902), літоўскі паэт і мовазнавец. З сям'і дзярж. прыгоннага. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1862). Быў праф. Каўнаскай духоўнай семінарыі, епіскапам. Напісаў паэму «Анікшчайскі бор» (1860) — класічны твор літоўскай паэзіі 19 ст., у якім апаэтызавана прырода Літвы, выказаны пратэст супраць

прыгону і царскага самаўладдзя. У некат. творах («Пяю песеньку», «Падарожжа ў Пецярбург», «Размова паэта з Літвой», «Неспакой») выявілася ідэйная абмежаванасць паэта. Пасля 1863 Б. адышоў ад паэтычнай творчасці, заняў вузканацыянальныя пазіцыі. Вывучаў дыялекты літоўскай мовы, сабраў багаты дыялектны матэрыял (выд. 1882, 1920—21), стварыў шэраг тэрмінаў літоўскай граматыкі.

Тв.: Бел. пер.— у зб.: Дзень паэзіі, Мн., 1966; рус. пер.— Аникщяйский бор, пер. Н. Тихонова, Вильнюс, 1952. *В. Бержынис.* Вільнюс.

БАРАНЕ́Ц, форма ўкраінскага ганчарнага посуду — бочачка на чатырох ножках з галавой барана. З 15 ст. традыцыйны атрыбут, звязаны з абрадамі сватаўства і вяселля. Пасудзіна ўпрыгожваецца ляпнымі аздобамі, каляровай палівай. У наш час Б.— арыгінальная дэкаратыўная рэч, сувенір.



БАРАНО́ВІЧ Аляксей Іванавіч (1892, с. Стараканстанцінаў Валынскай губ.— 3.5.1961), савецкі гісторык, д-р гістар. н. (1951). Скончыў гісторыка-філал. ф-т Петраградскага ун-та (1916). Да 1949 на пед. рабоце (Стараканстанцінаў, Кіеў, Сімферопаль, Краснадар), у 1949—61 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН СССР. Аўтар прац па сацыяльна-эканам. гісторыі Украіны, Беларусі, Літвы і Польшчы 16—18 ст.

Тв.: Украина и Белоруссия. Воссоединение Украины с Россией, у кн.: Очерки истории СССР. Период феодализма. XVII в., М., 1955, ч. 2, гл. 6; (разам з Х. Х. Крусам) Украина, Белоруссия и Прибалтика, у кн.: Всемирная история, т. 4, М., 1958; Украина накануне освободительной войны середины XVII в. (социально-экономические предпосылки войны), М., 1959.

БАРАНО́ВЫ ЛБЫ, згладжаныя і адпаліраваныя ледавіком скалістыя выступы карэнных горных парод. Назва паходзіць ад іх формы, якая нагадвае лбы бараноў. Даўж. да некалькіх соцень метраў, выш. да 50 *м*. Групы дробных Б. л. наз. кучаравымі скаламі. Вельмі пашыраны ў абласцях мінулых і сучасных абледзяненняў, асабліва ў раёнах з блізкім да паверхні выхадам крышталічных парод (Карэлія, Кольскі п-аў).

БАРАНО́УСКІ Аляксей Аляксандравіч [29.7(11.8).1907, Мінск — 20.4.1970], беларускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1953). Працаваў у Бел. трэцім драм. т-ры (1929—33), Бел. ТРАМе (1933—37), з 1937 у т-ры імя Я. Купалы (да 1967). Камедыйны акцёр. Створаныя ім вобразы вызначаюцца сакавітым нар. гумарам, своеасаблівай нац. афарбоўкай. З роляў: Елкін («Мой сябар» М. Пагодзіна), Мозес («Працяг будзе» А. Бруштэйн), Бадыль («Партызаны» К. Крапівы), Язэп («Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка), Каравай («Крылы» А. Карпейчука), Ахрэм, Верхаводка («На крутым павароце», «Простая дзяўчына» К. Губарэвіча). Здымаўся ў кіно («Несцерка» і інш.). Узнаг. 2 ордэнамі.

БАРАНО́УСКІ Ян Юзаф (1805, Смілавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 1888), фінансіст. Вучыўся ў шляхецкім пансіёне місіянераў у Смілавічах і ў Мінскай класічнай гімназіі. Скончыў юрыд. ф-т Віленскага ун-та са ступенню кандыдата права. Працаваў у Польскім банку, пасля ў Францыі работнікам банка, інспектарам бухгалтэрыі чыгункі Парыж — Руан — Гаўр. Вынайшаў машыну для кантролю падлікаў (taxe-machine), якая друкуе і кантралюе чыг. білеты, сістэму аўтаматычнай чыг. сігналізацыі. Ею карысталіся на некат. франц., англ. і італьян. чыгунках. Зрабіў больш за 10 інш. вынаходстваў у галіне чыг. і бухгалтарскага кантролю, распрацаваў многа рацыяналізатарскіх прапаноў у галіне фінансаў, найважнейшая — праект нар. франц. пазыкі.

БАРА́НСКІ Мікалай Мікалаевіч [14(26).7.1881, Томск — 29.11.1963], савецкі географ. Чл.-кар. АН СССР (1939). Праф. Маскоўскага ун-та (з 1929). Чл. КПСС. Удзельнік рэвалюц. руху, быў прадстаўніком бальшавікоў Сібіры на Тамерфорскай канферэнцыі РСДРП (1905). Асн. працы па эканам. геаграфіі СССР і замежных краін. Распрацоўваў раённы кірунак у сав. эканам. геаграфіі. Напісаў шэраг падручнікаў; падручнік па эканам. геаграфіі для 8-га класа вытрымаў 16 выданняў. Аўтар прац па тэорыі і метадалогіі эканам. геаграфіі і эканам. картаграфіі. Дзярж. прэмія СССР 1952. Герой Сац. Працы (1962).

БАРА́НЦ (Barendsz, Barents) Вілем (1550—20.6.1597), галандскі мараплавец. Каб знайсці паўн.-ўсх. праход у Ціхі ак., у 1594—97 ажыццявіў 3 плаванні па Паўн. Ледавітым ак. 1-я экспедыцыя (1594) дасягнула паўн. ўзбярэжжа Новай Зямлі, 2-я — в-ва Вайгач, у час 3-й Б. паўторна (пасля нарманаў і рускіх пераходаў) адкрыў Шпіцберген. Правёў метэаралагічныя і акіянаграфічныя назіранні ў моры, якое пазней было названа Баранцавым. Памёр у час зімоўкі на Новай Зямлі.

БАРА́НЦАВА МО́РА, ускраінае мора Паўн. Ледавітага акіяна. Аддзелена ад акіяна і суседніх мораў а-вамі Вайгач, Новая Зямля, Зямля Францыа-Іосіфа, Шпіцберген, Мядзведжы. На Пд абмывае паўн. берагі Еўропы. Мяжа з Белым м. паміж мысамі Святы Нос — Канін Нос. Пл. 1405 тыс. км². Пераважаюць глыб. ад 100 да 350 *м*. Найбольшая на ПдЗ — 590 *м*. Губы (залівы): Чэшская, Пячорская, Хайпудырская, Варангер-ф'ёрд і Порсангер-ф'ёрд. Вакол ускраінных а-воў і архіпелагаў шмат дробных а-воў. Найбольшы в-аў Калгуеў. На ПдЗ берагі высокія, скалістыя, парэзаныя невял. заліванамі і бухтамі; на У ад п-ва Канін — нізінныя. У Б. м. ўпадаюць Пячора і некалькі невял. рэчак. Клімат арктычны, але пад уплывам цёплага Нардкапскага цячэння (адгалінаванне Гальфстрыма) зіма адносна мяккая. Т-ра паверхневых водаў у лютым на Пн і У ніжэй за −1, на ПдЗ ад 3 да 5 °С; у жніўні на Пд ад 7 да 12, на У ад 3 да 5 °С, на Пн ніжэй за 0 °С. Салёнасць на Пн 32,0—33,0‰, на У 34,0—34,5‰, на ПдЗ каля 35,0‰. Зімой не замярзае толькі паўд.-вах. частка, на Пн лёд трымаецца круглы год. Прылівы правільныя паўсутачныя, на Пд больш за 11 *м*, на Пн меншаюць. Раслінны і жывёльны свет багаты і разнастайны. З млекакормячых: белы мядзведзь, нерпа, грэнландскі цюлень, нарвал і інш. Ловяць селядца, траску, марскога акуня, камбалу. На ўзбярэжжах птушыныя кірмашы. Гал. порт Мурманск.

Літ.: Добровольский А. Д. и Залогин Б. С. Моря СССР, М., 1965; Зенкевич Л. А. Моря СССР, их фауна и флора, М., 1951.

БАРАНЦЭВІЧ Антон Казіміравіч (каля 1837, в. Кірклішкі Ашмянскага пав.— 26.1.1918), удзельнік паўстання 1863 на Беларусі і ў Польшчы. З 1853 на вайсковай службе. Напярэдадні паўстання служыў у Лібаўскім пяхотным палку, падпаручнік. Паводле плана паўстання 12.4.1863 прыбыў з групай афіцэраў белastоцкага гарнізона на зборны пункт і ўзначаліў спачатку падраздзяленне ў галоўным паўстанцкім атрадзе Гродзенскай губ., а потым асобны атрад. Паплечнік В. *Урублеўскага*; паказаў сябе як здольны партыз. камандзір. Пасля разгрому паўстання ў студз. 1864 эмігрыраваў у Парыж. З 1869 жыў у Галіцыі, інжынер шляхоў зносін. Напісаў успаміны «Апошнія дні конпага літоўскага атрада» (у кн.: W Czterdziestą rocznicę Powstania Styczniowego 1863—1903, Lwów, 1903). *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

БАРАНЫ (Ovis), род парнакапытных жывёл сямейства пустарогіх. Даўж. Б. да 1,4 *м*, маса 40—200 *кг*. Цела моцнае, на высокіх нагах. У самцоў вялікія масіўныя рогі, у самак меншыя, часам зусім няма. Пашыраны ў Азіі і зах. раёнах Паўн. Амерыкі, у Еўропе — у запаведніках і паляўнічых гаспадарках. Род складаецца з 2 відаў: еўрап.-азіяцкага (архара, або горнага барана) і азіяцка - амерыканскага (снежнага барана). Абодва ўтвараюць вялікую колькасць геагр. рас. Жывуць у гарах. Кормяцца травяністай расліннасцю. Штогод нараджаюць 1—2 ягнят. Жывуць Б. 12—13 гадоў. Род Ovis з'яўляецца прабацькам *авечкі свойскай*. Б. выкарыстоўваюць і цяпер для гібрыдызацыі з пародамі свойскіх авечак (горны мерынос, казахскі архарамерынос). Маюць паляўнічае значэнне (даюць мяса і шкуру).



Азіяцкі муфлон.

БАРАНЬ, рабочы пасёлак (з 1935) у Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Падпарадкоўваецца Аршанскаму гар. Савету. На беразе р. Адроў. За 9 *км* на ПдЗ ад Оршы, 89 *км* ад Віцебска. Аўтобусная станцыя. 10,1 тыс. ж. (1969).



Барань. Дом культуры.

Філіялы ф-кі быт. абслугоўвання і індывідуальнай пашыўкі адзення. Сярэдняя школа, школа рабочай моладзі, 5 дашкольных устаноў, Палац культуры, б-ка, бальніца. У ліп. 1905 Аршанская арг-цыя РСДРП арганізавала ў Б. забастоўку 200 рабочых. Абеліск на брацкай магіле 25 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАРАТАШВІЛІ Ніколаз Мелітонавіч [15(27).12.1817, Тыфліс — 9(21).10.1845], грузінскі паэт-рамантык. Скончыўшы Тыфліскую гімназію (1835), працаваў чыноўнікам у родным горадзе. У 1844 прызначаны пам. нач. Нахічэванскага пав., у 1845 пераведзены на тую самую пасаду ў Ганджу, дзе памёр ад малярыі. У Тыфлісе напісаў лепшыя творы: «Мерані», «Мая малітва», «Роздум на беразе Куры», «Завушніца», «Лёс Грузіі». Спадчына Б.— 37 вершаў і паэма. У лірыцы адбіліся цяжкія ўмовы жыцця народа, в якімі не мог мірыцца свабадалюбны паэт; ёсць матывы адчаю, песімізму, адзіноты («Адзінокая душа», «Злы дух», «Знайшоў я храм»), але найлепшыя творы прасякнуты глыбокім грамадз. пафасам, аптыміст. верай у светлую будучыню груз. народа. Паэзія Б. экспрэсіўная і музычальная, арыгінальная вершаванымі формамі; значнае месца займае ў ёй філас. і любоўная лірыка («Чынара», «Блакітны колер», «Маёй зорцы»). На бел. мову тв. Б. перакл. А. Астрэйка, А. Вялюгін, Е. Лось і інш.



Тв.: Бел. пер. у час.: «Полымя», 1945, № 10; 1968, № 9; «Беларусь», 1968, № 9; рус. пер.— Лирика, М., 1967; Стихотворения, поэма, письма, Тбилиси, 1968.

Літ.: Гацерелиа А. Николоз Бараташвили, Тбилиси, 1968.

БАРАТРАЎМА (ад грэч. báros цяжар+ +trauma пашкоджанне), пашкоджанне арганізма, выкліканае зменамі бараметрычнага ціску ў навакольнай атмасферы. Пры Б. перш-наперш пашкоджваюцца органы, у якіх ёсць паветра ці інш. газы (сярэдняе вуха, лёгкія, прыдатачныя пазухі носа, кішэчнік). Найчасцей бывае ў лётчыкаў, вадалазаў, падводнікаў. Вядомыя Б. ў артылеры-

стаў і масавыя Б. ў людзей, што пацярпелі ад ядзернага выбуху. Пры Б. вуха адчуваецца ўдар у барабанную перапонку, боль, звон, галавакружэнне, кровазліццё ў барабанную перапонку, разрывы яе. Пры Б. лёгкіх бывае кашаль, выдзяленне пеністай крывяністай макроты. Прафілактыка: строгі мед. адбор асоб для работы ва ўмовах дзеяння барафактараў, трэніроўкі ў баракамерах, карыстанне процішумамі. Лячэнне: вызваленне пацярпелага ад работы ва ўмовах дзеяння барафактараў, стэрыльная павязка на вуха, сімптаматычнае лячэнне. *І. А. Склят.* Мінск.

БАРАТРОН, гл. *Лямпа звышвысокачастотная.*

БАРАТЫ прыродныя, група мінералаў, соляў борных кіслот (метаборнай HBO_2, ортаборнай H_3BO_3, тэтраборнай $H_2B_4O_7$, асабліва гексаборнай $H_4B_6O_{11}$). У саставе Б. пераважаюць кальцый, магній і патрый. Зрэдку трапляюцца бараты жалеза, вельмі рэдка бараты алюмінію і волава. Вядомы складаныя сульфатбараты і хлорабараты.

Есць Б. бязводныя (*барацыт* $Mg_3B_7O_{13}Cl$, *ашарыт* $MgHBO_3$, *людвігіт* $(Mg, Fe)_2Fe^{3+}BO_5$ і інш.) і водныя (*бураксе* $Na_2B_4O_7 \cdot 10H_2O$, гідрабарацыт $CaMgB_6O_{11} \cdot 6H_2O$, боранатрыкальцыт $NaCaB_5O_9 \cdot 8H_2O$ і інш.). У прыродзе вядома каля 40 мінералаў, але роля баратаў у будове зямной кары нязначная. Асн. маса бору сканцэнтравана ў сілікатах. Б. крышталізуюцца ў рамбічнай і манаклінай сістэмах. Звычайна бясколерныя або белыя. Цв. ад 1 да 7; шчыльн. 2600—4000 *кг/м*³. Паходжанне асадкавае (у хемагенных асадках стараж. азёраў), гідратэрмальнае (у вулканічных абласцях, у адкладах газавых вулканаў), гіпергеннае (у зоне выветрывання). Сыравіна для вытв. бору, бураксу, борнай к-ты, антычнага і кіслотатрывалага шкла і інш. Радовішчы ў СССР (Тамански і Керчанскі п-вы, воз. Індэр), КНР, ЗША, Турцыі, Чылі, Перу, Аргенціне, Індыі і інш.

БАРАТЫНСКІ Яўген Абрамавіч [19.2(2.3). 1800, в. Мара Тамбоўскай губ.— 29.6(11.7). 1844], рускі паэт. З небагатых дваран. Вучыўся ў Пецярбургскім корпусе (1812—16), адтуль быў выключаны. У 1819 служыў радавым у Пецярбургскім, у 1820—25 унтэр-афіцэр у Фінляндыі. З 1826 пайшоў у адстаўку і пасяліўся ў Маскве. Апошнія гады жыў у падмаскоўным маёнтку Мураново, які належаў Ф. І. Цютчаву (з 1920 літ.-мемарыяльны музей). У 1844 паехаў у Італію. Памёр у Неапалі, пахаваны ў Пецярбургскім. Літ. дзейнасць пачаў у 1819. У многіх вершах адчуваецца блізкасць да ідэй дзекабрыстаў. Элегіі і паслані вызначаюцца глыбокай шчырасцю і псіхалагізмам. Пасля разгрому дзекабрыстаў у лірыцы Б. мацнеюць песімістычныя матывы, яго паэзія набывае акрэслена філас. характар. Аўтар паэм «Эда» (1826), «Піры» (1826), «Баль» (1828). Творы Б. высока ацэньвалі А. Пушкін і В. Бялінскі.

Тв.: Стихотворения. Поэмы. Проза. Письма, М., 1951; Полн. собр. стихотворений, 2 изд., Л., 1957.

БАРАЎЛЯНЫ, вёска ў Зялёналужскім с/с Мінскай вобл. За 7 *км* на Пн ад Мінска, на шашы Мінск — Лагойск. 2282 ж., гасп. 644. (1970). Доследная гасп. Мін-ва с. гасп. БССР, вучэбная гасп. (вучгас імя Фрунзе) Бел. ін-та механізацыі сельскай гаспадаркі, камбінат быт. абслугоўвання. *Анкалогіі і медыцынскай радыялогіі навукова-даследчы інстытут,* сярэдняя школа, 4 клубы, 6 б-к, 2 дзіцячыя сады, 2 дзіцячых яслі, рэсп. бальніца, дзіцячае аддз. раённай бальніцы, 2 аптэкі, фельч.-ак. пункт, шпіталь інвалідаў Вял. Айч. вайны, 2 аддз. сувязі, 3 магазіны. У 1941—44 у Б. быў канцлагер для ваеннапалонных.

БАРАЎЦЫ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 10 *км* на ПнЗ ад Вілейкі, 112 *км* ад Мінска, на шашы Вілейка — Смаргонь. 519 ж., дварoў 198 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. Радзіма Героя Сав. Саюза К. М. *Зубовіча.*

БАРАЦІНКІ, папулярная назва медных літоўскіх і польскіх манет — *солідаў* 1659—66. Назва ад імя Ціта Лівія Бараціні, ініцыятара іх выпуску і трымальніка манетных двароў Рэчы Паспалітай у 2-й пал. 17 ст. Рашэнне Варшаўскага сейма 1659 прадугледжвала выпуск Б. на 1 млн. злотых для Польшчы і Вял. кн. Літ. Фактычная ж эмісія іх была перавышана больш як у 10 разоў, што адмоўна ўплывала на фінансы Рэчы Паспалітай і Вял. кн. Літ. На Беларусі Б. (літоўскія) выпускаў *Брэсцкі манетны двор.*

В. Н. Рабцэвіч. Мінск.

БАРАЦЫТ, мінерал групы бязводных *баратаў* $Mg_3B_7O_{13}Cl$. Мае 62,5% B_2O_3. Крышталі псеўдакубічнай (рамбічнай) сістэмы. Утварае суцэльныя зярністыя масы. Колер белы, жаўтаваты, зеленаваты, шэры, блакітны. Цв. 7,5; шчыльн. 2900—3200 *кг/м*³. Паходжанне асадкавае. Пракідаецца ў саляных радовішчах марскога тыпу разам з ангідрытам, гіпсам, галітам, карналітам. Сыравіна для вытв. бору. Радовішчы ў ГДР.

БАРАЦЬБА спартыўная, адзінаборства паводле пэўных правілаў. У міжнар. спорце прыняты: Б. класічная, вольная, дзюдо, самба. У некат. капіталіст. краінах развіты прафесійн. віды Б., напр. кетч.

Б. класічная і вольная праводзіцца на дыване (маце) памерам (*м*) 6×6 ці 8×8. Перамагае той, хто паложыць саперніка «на лапаткі» ці набярэ больш ачкоў за кошт тэхн. прыёмаў і актыўнасці. Б. вядзецца ў стойцы і партэры (барэц стаіць на каленях, упёршыся ў дыван далонямі выпрастаных рук ці перадплеччам). Цягнецца пяцьдзесят 9 *мін* (тры перыяды, кожны з мінутным перапынкам). Існуе 10 вагавых катэгорый. У Б. класічнай выкарыстоўваюцца кідкі, пераводы, перавароты і інш. прыёмы, але барцам не дазволена хапаць саперніка ніжэй пояса. У Б. вольнай, у адрозненне ад класічнай, барцу можна падсякаць, падбіваць, хапаць саперніка ніжэй пояса і г. д.

Б. дзю-до больш складаная, чым класічная і вольная. Пачынаюць дзюдаісты праходзіць на татамі (дыван з цыноўак ці матэ). Схваткі па рашэнні суддзяў цягнуцца 3—15 *мін.* Перамога дасягаецца за кідок саперніка на спіну, за зваленне ў партэры прыём задушэння ці за ўтрыманне барца на спіне (на працягу 30 *сек*). Існуюць вагавыя катэгорыі ад 63 да 93 *кг* і больш, а таксама абсалютная вага. За тэхніку выканання кідкоў барцам даюцца разрады: кю — найніжэйшыя, даны (ад 1 да 14) — найвышэйшыя. Форма адзення: кімано з поясам (белы пояс у навічкоў), чорны ў спартсменаў больш высокіх разрадаў).

Б. самба, скарочаная назва рускага тэрміна «самозащита без оружия». Бывае спартыўнае і баявое. Барцам дазваляецца хапаць рукі і ногі праціўніка, кідаць цераз плечы, спіну, галаву, рабіць балевыя прыёмы (перагінаць рукі ці нагу

супраць згібу сустава). Перамога дасягаецца за кідок на спіну ці за перавод саперніка на болевы прыём. Форма адзення: куртка з поясам і мяккія чаравікі. Асн. прыёмы Б. самба выкарыстоўваюцца для самаабароны (баявое самба) у рукапашнай схватцы. Спец. частка Б. самба ўключае прыёмы затрымання, абязбройвання праціўніка і г. д.

Б. спартыўная ўваходзіла ў пяціборства (пентатлон) у стараж. Алімп. гульнях (грэка-рымская). Развівалася ў Францыі (французская Б.) і ў інш. еўрап. краінах. У 1896 распрацаваны правілы сучаснай класічнай Б. Першы ўсерасійскі чэмпіянат барцоў-аматараў адбыўся ў 1897 (Пецярбург). Спарт. дзейнасць рускіх барцоў-прафесіяналаў К. Буля, І. Заікіна, І. Паддубнага, І. Шамякіна спрыяла развіццю і папулярызацыі Б. ў Расіі. У СССР Б. класічная стала сродкам фіз. выхавання моладзі. Пяршынствы СССР праводзяцца з 1924, у 1947 сав. барцы ўвайшлі ў міжнар. аматарскую федэрацыю (ФІЛА). Б. вольная ўключана ў праграму Алімп. гульняў з 1904. Пашырылася ў Іране, Балгарыі, Турцыі, Японіі. У СССР спаборніцтвы па вольнай Б. наладжваюцца з 1945. Сав. барцы вольнага стылю выкарысталі вопыт класічнай Б., самба, нац. відаў Б. (гюлеш, картулі-чыдааба, кураш, трыптэ і інш.). Б. дзю-до развілася ў 19 ст. з сістэм В. джыу-джыцу. Пашырылася ў Японіі як нац. від Б. У 1954 арганізавана Міжнар. федэрацыя, праводзяцца пяршынствы свету, чэмпіянаты Еўропы. Уключана ў праграму Алімп. гульняў. Зб. каманда СССР (створана ў 1938) — чэмпіён Еўропы (1963—66). Бел. спартсмен В. Касянюк — чэмпіён Еўропы 1968 сярод юніёраў. В. самба ўключае неабходныя для самаабароны элементы Б.: грузінскай (гідаабан), таджыкскай (гаўштан), узбекскай (кураш) і азербайджанскай (гулеш) і інш. З 1939 праводзяцца пяршынствы СССР.

На Беларусі Б. класічная вядома са старажытнасці пад назвай «барацьба на крыжы». Падножкі, падбівы і штуршкі ў ёй забараняліся. У 1913 у Мінску было адкрыта т-ва «Санітас», якое праз год правяло першы чэмпіянат горада сярод барцоў-аматараў. З 1923 праводзяцца пяршынствы гарадоў і акруг БССР. Бел. барцы сталі ўладальнікамі Кубка СССР па класічнай Б. (1938). У 1960 зборная каманда БССР перамагла ў першынстве СССР. Класічнай Б. у рэспубліцы займаецца 6 тыс. спартсменаў (1969). Бел. школа класічнай Б. выхавала (па 1969) каля 250 майстроў спорту СССР, сярод іх пераможца XVII Алімп. гульняў (1960), чэмпіён свету (1958, 1961) і СССР (1956—60, 1962), засл. майстар спорту СССР А. *Караваеў*, чэмпіёны СССР М. Чучалаў (1960, 1963), С. Залускі (1960), І. Качаргін (1962), В. Жыцянёў (1963), В. Фефелаў (1967), У. Сусіч (1968). Зборная каманда БССР па класічнай Б. перамагла ў міжнар. сустрэчах барцоў Фінляндыі (1962), ГДР (1963), Венгрыі (1965, 1969), Чэхаславакіі (1966) і інш. Спецыялісты па класічнай Б. ў БССР — засл. трэнер СССР М. Мірскі, засл. трэнеры БССР І. Коршунаў, А. Куцэнка, Р. Майзельс, В. Стулькевіч. Б., падобная на сучасную вольную Б., была вядома на Беларусі пад назвай «барацьба да крыжа». Барцам можна было рабіць падножкі, падбівы, штуршкі, хапаць ногі. Б. вольная ў БССР развіваецца з 1948. Займаецца ёю каля 7 тыс. спартсменаў, больш за 160 майстроў спорту СССР (1969). Бел. спартсмен засл. майстар спорту СССР А. *Мядзведзь* — пераможца XVIII і XIX Алімп. гульняў (1964, 1968), чэмпіён свету (1962—63, 1966—67, 1969), Еўропы (1968—69) і СССР (1961—63, 1966—69), У. Лятуп — чэмпіён краіны 1961. Барцы М. Аксёнаў, І. Караваеў, С. Лісафін і інш. былі прызёрамі міжнар. і ўсесаюзных спаборніцтваў па вольнай Б. Бел. школу вольнай Б. ўзначальваюць засл. трэнеры СССР П. Грыгор'еў, Б. Рыбалка; засл. трэнеры БССР Р. Карыцкі, М. Файбышаў, Л. Фурса. Б. самба на Беларусі пашырана з 1953, калі пачалі стварацца секцыі самба ў Віцебску, Мінску, Оршы. Барцы М. Мелікаў, К. Нядбайла, У. Шайко і інш. былі прызёрамі ўсесаюзных спаборніцтваў па самба. Спецыялісты Б. самба ў БССР — засл. трэнеры БССР В. Зубкоў, В. Сянько.

Літ.: Алиханов И. И. Вольная борьба, М., 1959; Харлампиев А. А. Борьба самбо, М., 1964; Гулевич Д. И. и Звягинцев Г. Н. Борьба самбо, М., 1968; Кулешов А. П. Познакомьтесь — дзю-до, М., 1963.

Л. В. Краўцоў, А. В. Мядзведзь, В. М. Сянько. Мінск.

«БАРАЦЬБА», газета КПЗБ, разлічаная на рэвалюц. сялян і рабочых Зах. Беларусі і беларусаў-эмігрантаў, якія жылі ў краінах Зах. Еўропы і Амерыкі. З прычыны рэпрэсій польскіх улад выдавалася ў Берліне. Выходзіла на бел. мове з кастр. 1932 да лютага 1933. Выдадзена 5 нумароў. Адрасатам у Зах. Беларусь перасылалася па пошце з Францыі. «Б.» змагалася за сацыяльнае і нац. вызваленне Зах. Беларусі і ўз'яднанне з БССР, асвятляла судовы працэс над Б. А. *Тарашкевічам* (1932), дзейнасць Т-ва бел. школы (ТБШ). Закрыта пасля прыходу да ўлады ў Германіі фашыстаў. *С. В. Говін.* Мінск.

«БАРАЦЬБА», падпольная газета, орган Камуністычнай рабочай партыі Польшчы (КПРП). Была разлічана на рабочых, працоўных сялян, с.-г. рабочых (батракоў), парт. і камсамольскі актыў Зах. Беларусі. Выдавалася з 15.8.1921 да канца 1922 на бел. мове (частку матэрыялаў друкавала на рус. мове). Вядома 10 нумароў. Тыраж 2—3 тыс. экз. Аўтарамі артыкулаў былі кіруючыя работнікі арг-цый КПРП у Зах. Беларусі. Газета адлюстроўвала класавую барацьбу працоўных (забастоўкі рабочых Гродзенскай тытунёвай ф-кі, гарбароў і будаўнікоў Слоніма і інш.), пісала пра жыццё Сав. Расіі і БССР.

М. А. Ракевіч. Мінск.

БАРАЦЬБА ЗА ІСНАВАННЕ, сукупнасць складаных узаемаадносін жывых арганізмаў паміж сабой і з навакольным асяроддзем, у выніку якіх выжываюць і пакідаюць патомства найбольш прыстасаваныя асобіны. Тэрмін уведзены Ч. Дарвінам, які распрацаваў асн. палажэнні тэорыі Б. за і. і адзначыў вялікую ролю гэтай з'явы ў эвалюцыі. Тэорыю Б. за і. развівалі І. І. Шмальгаўзен, А. М. Северцаў і інш. айчынныя і замежныя вучоныя. Б. за і. абумоўлена бязмежным імкненнем арганізмаў да размнажэння і супрацьдзеяннем навакольнага асяроддзя. У барацьбе за жыццё і размнажэнне частка асобін гіне або астаецца без патомства ад шкодных фізічных умоў, уздзеяння інш. арганізмаў (драпежнікаў і паразітаў), адсутнасці ежы. Адрозніваюць прамую (актыўную) форму Б. за і. і ўскосную (пасіўную). У першым

выпадку адбываецца непасрэдная сутычка асобін у барацьбе за месца пражывання, ежу або магчымасць размнажацца. Расліна з больш развітымі каранямі атрымлівае больш вады і пажыўных рэчываў з глебы на шкоду сваім суседзям; у бойцы самцоў з-за самак у перыяд спарвання гінуць слабейшыя і да т. п. Актыўная форма Б. за і. абвастраецца ў перыяд зімовай пяхваткі кармоў або пры павелічэнні шчыльнасці насельніцтва. Ускосная, пасіўная Б. за і. выяўляецца ў больш складаных формах (спаборніцтва, ускосная канкурэнцыя), калі сродкі існавання арганізмаў адны і тыя ж, а процідзеянне шкодным умовам — рознае. Устойлівасць да холаду, здольнасць лепш абараняцца або ўцякаць ад драпежнікаў дае магчымасць жывёлам зберагчы жыццё і даць патомства. У гэтым выпадку Б. за і. непасрэдна не закранае інтарэсаў інш. асобін і не абвастраецца пры павелічэнні колькасці віду. Ускосная Б. за і. пераважае.

Б. за і. паміж арганізмамі падзяляюць на ўнутрывідавую і міжвідавую. Унутрывідавая ідзе паміж істотамі аднаго віду, асобіны якога маюць розную актыўнасць, розныя магчымасці асвойваць тэрыторыю, кармы і інш. Актыўная форма ўнутрывідавой барацьбы: захоп месцаў гнездавання, нераставання, пажывы, канкурэнцыя за спарванне. Пасіўная форма заснавана на рознай здольнасці арганізмаў процідзейнічаць шкоднаму ўплыву навакольнага асяроддзя. Унутрывідавая Б. за і. адбываецца не толькі паміж асобнымі асобінамі, але і паміж сем'ямі, групамі або грамадствамі (пчол, мурашак), калі адны сем'і ці групы выцясняюцца больш прыстасаванымі. Міжвідавая Б. за і. адбываецца паміж асобінамі розных відаў: пустаселлем і культурнымі раслінамі, драпежнікамі і іх ахвярамі, паразітамі і гаспадарамі. Выцясняюцца; гінуць або астаюцца без патомства заўсёды слабыя і менш прыстасаваныя асобіны і групы. Таму Б. за і. вядзе да натуральнага адбору, г. зн. да выжывання найбольш прыстасаваных (гл. *Адбор*). Б. за і. — адзін з асн. фактараў эвалюцыі.

Перанясенне Б. за і. на чалавечае грамадства паслужыла крыніцай адной з найбольш рэакцыйных плыняў бурж. сацыялогіі — *сацыял-дарвінізму*.

Літ.: Дарвин Ч. Происхождение видов путем естественного отбора, Соч., т. 3, М.—Л., 1939; Пузиков П. Д. Философские основы эволюционного учения Дарвина, Мн., 1959; Северцов А. Н. Главные направления эволюционного процесса, 3 изд., М., 1967; Современные проблемы эволюционной теории, Л., 1967; Шмальгаузен И. И. Факторы эволюции, 2 изд., М., 1968.

І. Б. Масэ. Мінск.

БАРАЦЬБА ПРОЦІЛЕГЛАСЦЕЙ, гл. *Адзінства і барацьба процілегласцей*.

БАРАШКА Ілары [Іларыён Мацвеевіч; 12(25).7.1905, Мінск — 3.6.1968], беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1931. З сям'і рабочага. Працаваў у час. «Полымя», «Малады араты», «Маладняк», газ. «Чырвоная змена». Скончыў БДУ (1930). Быў рэдактарам на кінастудыі «Белдзяржкіно» (1932—36). У 1941—44 на Ціхаакіянскім і Чарнаморскім флотах. Пасля вайны — у мін-вах культуры СССР і РСФСР. Літ. дзейнасць пачаў у 1924. Першы аб. прозы «У прасторы» (1926). У 1929 выйшла аповесць «Рыгор Галота», у 1931 аб. апавяд. «На розныя тэмы», «Камунары», вершаваны нарыс «Асіпстан». У іх адлюстроўвае гераіку грамада. вайны, змены ў жыцці бел. народа, якія прынёс Кастрычнік. Па сцэнарыях Б. зняты фільмы «Дняпро ў агні» (сааўтар Р. Кобец, 1937), «Якуб Колас — народны паэт Беларусі», «Георгій Скарына» і інш.

Тв.: Блізкія далі, Мн., 1959.

Літ.: Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць, Мн., 1968, с. 175—178.

БАРАШКАЎ Міхаіл Парфенавіч (1908, в. Бель 3-я Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 21.2.1944), беларускі савецкі журналіст. Чл. КПСС з 1929. З сялян. У 1930—33 вучыўся ў Камуніст. ін-це журналістыкі ў Мінску. Рэдагаваў раённыя газеты — чавускую «Калгасны сцяг» і дубровенскую «За сацыялістычнае будаўніцтва», з 29.1. 1939 рэсп. маладзёжную газ. *«Чырвоная змена»*. У пач. Айч. вайны палітработнік на Калінінскім фронце, пазней на падпольнай рабоце на Віцебшчыне. У студз. 1943 — лют. 1944 рэдактар падпольнай газ. *«Звязда»*, якая выпускалася ў зоне Мінскага партыз. злучэння. 31.1.1943 пачала друкавацца і падпольная газ. «Чырвоная змена», у склад рэдкалегіі якой уваходзіў Б. Узнаг. 2 ордэнамі.



Літ.: Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967, с. 296—299; Наша «Звязда», Мн., 1968, с. 118—130.

А. С. Шурпач. Мінск.

БАРАШКІН Дзмітрый Іванавіч (н. 1.9.1922, в. Шавялі Віцебскага пав.), перадавік машынабудаўнічай вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1948. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Працоўную дзейнасць пачаў у 1940 у Віцебску рабочым трэста Белпрамбуд. З 1944 рабочы на буд-ве Мінскага аўтамаб. з-да, падручны сталявара, з 1947 сталявар. Дэп. Вярх. Савета БССР 4—6-га скл. Ганаровы грамадзянін Мінска. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Зоркі.



БАРАШЫ, вёска ў Жукнеўскім с/с Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 25 *км* на У ад Талачына, 120 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Коханава. 92 ж., дварой 25 (1970).

БАРБАДАС (Barbados), дзяржава на аднайменным в-ве ў Атлантычным акіяне, які ўваходзіць у групу Малых Антыльскіх а-воў. У складзе Садружнасці нацый, якую ўзначальвае Вялікабрытанія. Пл. 430 *км*². Нас. 251 тыс. чал. (1969). Сталіца і гал. порт Бриджтаўн. Дзейнічае канстытуцыя 1966. На чале дзяржавы стаіць англ. кароль (каралева



Бриджтаўн. Гавань.

Лізавета II), якога прадстаўляе генерал-губернатар. Заканадаўчая ўлада належыць дзвюхпалатнаму парламенту. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад. Ген.-губернатар назначае прэм'ер-міністра і міністраў.

Прырода, насельніцтва. Востраў Б. складзены пераважна з міяцэнавых вапнякоў. Паверхня плоская. Клімат трапічны, пасатны, гарачы. Сярэдняя т-ра вер. 27,3, лютага 25 °С. Ападкаў каля 1400 *мм* за год. Расліннасць трапічная. Жывуць пераважна негры і мулаты. Афіц. мова англійская, насельніцтва гаворыць на яе мясцовым дыялекце. Рэлігія англіканская.

Гістарычная даведка. Б. быў захоплены англ. каланізатарамі ў 1627 і населены неграмі-рабамі з Зах. Афрыкі. Вязлітасная эксплуатацыя выклікала масавае паўстанне рабоў у 1649. У 30-я г. 19 ст. пад пагрозай новых паўстанняў і ў сувязі з крызісам плантацыйнай сістэмы гаспадаркі рабства было адменена. З канца 30-х г. 20 ст. пачаўся рост нац.-вызв. руху (масавыя забастоўкі, галодныя паходы). У 1958—62 Б. уваходзіў у каланіяльскую Вест-Індскую федэрацыю. Спробы Англіі стварыць на яе руінах т. зв. Усходнекарыбскую федэрацыю з-за апазіцыі Б. не мелі поспеху. 30.11.1966 была абвешчана незалежнасць Б. Урад Б. ўзначальвае Дэмакр. лейбарыстская партыя, лідэр якой Э. У. Барроў выступае супраць каланіялізму, за развіццё адносін з СССР і ўсімі краінамі. Б. — чл. ААН са снеж. 1966.

Гаспадарка. Б. — слабаразвітая аграрная краіна, залежыць ад англ. капіталу. У с. гасп. выкарыстоўваецца больш за 70% тэр.; пад пасевамі 29 тыс. *га*, пад пашай 7,7 тыс. *га*. Гал. с.-г. культура цукр. трыснёг (24 тыс. *га*, 1967); у 1966 было сабрана 1,8 млн. *т*. Вытв. цукру-сырцу склала 202 тыс. *т* (1967). Асн. спажывецкія культуры: бататы і ямс (2 тыс. *га*, збор 20 тыс. *т* у 1965), маніёк. Садоўніцтва (манга, авакада, цытрусавыя, гуява і інш.). Гадоўля пераважна авечак, коз, свіней, буйн. раг. жывёлы. Рыбалоўства. Прамысловасць у асн. цукровая (22 з-ды), вытв. рому, маргарыну, буд. матэрыялаў. Невялікі нафтаперапр. з-д. Вялікае значэнне мае замежны турызм. Б. вывозіць цукар (больш за 50% экспарту), патаку, ром; увозіць абсталяванне і транспартныя сродкі, харч. тавары, паліва. Гал. партнёры ў гандлі: Вялікабрытанія, ЗША. Грашовая адзінка — усх.-карыбскі долар.

Асвета. Пач. школа 6-гадовая (першыя 2 гады навучання — «школа для малых»), сярэдняя школа 5 гадоў, у сярэднюю з 11. Навучанне бясплатнае. У 1967 у пач. школах займалася 44 тыс., у сярэдніх 12,8 тыс. чал. Ёсць прафесіян. школы (на базе пач. школы). Настаўнікаў агульнаадук. школ рыхтуе Эрдынстонскі настаўніцкі каледж. У Бриджтаўне філіял ун-та Вест-Індыі (засн. у 1963), публічная б-ка і музей Б., пры якім гістар. таварыства.

Літаратура. Пісьмовая л-ра (на англ. мове) узнікла ў 40-я г. 20 ст. пад уплывам нац.-вызв. барацьбы. У творчасці паэтаў Х. А. Вогана, Ф. Э. Колімара, П. Блекмена, У. Т. Берпса, Дж. Дрэйтана вялікае месца займаюць вест-індскія матывы. Навелісты К. Сілі, Э. Уолкат, К. М. Хоўп і інш. паказваюць цяжкае становішча працоўных в-ва. Многія пісьменнікі пакінулі Б., але іх творчасць па-ранейшаму звязана з радзімай. Дж. Лэмінг (жыве ў Англіі) у раманах распрацоўвае сучасныя праблемы вест-індскіх дзяржаў. Раманы О. Кларка (жыве ў Канадзе) адлюстроўваюць жыццё беднякоў Б. З 1950 выдаецца літ. час. «Bim», які ўплывае на развіццё ўсёй вест-індскай л-ры.

БАРБАМІЛ, лякарства на сон, супакаяльны і процісутаргавы сродак. Вытворнае барбітуравай к-ты. Прыгнятае цэнтр. нервовую сістэму. Ад Б. хутка засынаюць, спяць 6—8 гадзін. Ужываецца ў таблетках або парашках. Проціпаказаны пры хваробах печані, нырак, пры цяжарнасці.

«БАРБАРОСА ПЛАН» («Barbarossa Fall»), комплекс дакументаў, у якіх былі распрацаваны план, метады і сродкі вайны гітлераўскай Германіі супраць СССР.

Назва ад прозвішча герм. імператара Фрыдрыха I Барбароса, які ў 12 ст. ўзначальваў паходы крыжаносцаў на Усход. Першы варыянт плана, падрыхтаваны пад канец лета 1940, быў праверапы ў ваен. гульнях. Канчаткова ўхвалены Гітлерам і вышэйшым генералітэтам у снеж. 1940. Гал. мэта «Б. п.» — поўны разгром і ліквідацыя Сав. дзяржавы, фіз. знішчанне і высяленне карэннага насельніцтва в ўсёй тэр. да Урала, замена яго нямецкімі каланістамі; стратэгічная аснова — ідэя «маланкавай вайны». Меркавалася нанесці раптоўныя масіраваныя ўдары ў напрамку Масквы, Ленінграда, Украіны, Паўн. Каўказа, захапіць жыццёва важныя цэнтры СССР, выйсці на лінію Волга — Архангельск, за якой, на думку герм. генштаба, арганізаванага супраціўлення з боку Чырв. Арміі ўжо не будзе. Вайну планавалася закончыць да зімы 1941.

Для ажыццяўлення «Б. п.» фаш. камандаванне сканцэнтравала на граніцы з СССР 181 дывізію, 18 брыгад войск Германіі і яе сатэлітаў — Румыніі, Венгрыі, Фінляндыі і 22.6.1941 без абвяшчэння начало вайну супраць СССР. У ходзе вайны Германія была разгромлена. Гл. таксама *Акупацыйны рэжым*, *Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—45*.

БАРБАРОЎ, вёска ў Мазырскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Серп і молат». Прыстань на р. Прыпяць. За 33 *км* на ПдУ ад Мазыра, 166 *км* ад Гомеля, 31 *км* ад чыг. ст. Козенкі. 453 ж., двароў 151 (1970). Цагельня, камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі. У Айч. вайну ў Б. і навакольлі дзейнічаў славацкі партыз. атрад; вёску спалілі фашысты. Помнік сав. воінам, партызанам і славакам.

БАРБАРУС (Barbarus) Іаганес Якавіч (сапр. Варэс; 12.1.1890, хутар Кійза вол. Хейманлі — 29.11.1946), эстонскі савецкі паэт і дзяржаўны дзеяч. Засл. пісьменнік Эст. ССР (1945). Чл. КПСС з 1940. З сялян. Скончыў мед. ф-т Кіеўскага ун-та (1914). Праца-

ваў урачом (1914—39). У 1940—46 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета Эст. ССР. Друкавацца пачаў у 1910. Першыя зб. «Фата Маргана» (1918) і «Чалавек і сфінкс» (1919) — інтымная лірыка з моцным уплывам сімвалізму і акмеізму. Экспрэсіяністская грамадз. лірыка антыбурж. і антываен. накіраванасці склала зб. «Катастрофы» (1920) і «Суадносіны» (1922). У сярэдзіне 20-х г. паэзія Б. мела і некат. рысы кубізму і канструктывізму (зб. «Геаметрычны чалавек», 1924). Зблізіўшыся з рабочым рухам, у 30-я г. Б. становіцца паэтам-рэалістам, адкрыта выступае супраць бурж. правіцеляў Эстоніі (зб. «Свет адкрыты», 1930; «Эстонская рэспубліка», 1932; «Рыбы на сушы», 1937) і фашызму (брашура «Іспанія ў агні», 1937). У 1928 і 1935 наведаў СССР, стаў яго верным сябрам. Творы перыяду Айч. вайны (зб. «Узброеныя вершы», 1943; «На франтавых дарогах», 1944) — патрыят. грамадз. лірыка, у якой спалучаюцца нац. традыцыі і высокае пачуццё абавязку перад сацыялістычным Айчынай.



Тв.: Рус. пер.— Стихотворения, М., 1943; Избранное, Таллин, 1948. *Х. Х. Пеэп.* Тарту.

БАРБАРЫС (Berberis), род раслін сямейства барбарысавых. Кусты галінастыя, з калючкамі, выш. да 4 *м*. Лісце яйцападобнае, ланцэтнае, эліптычнае, у пучках. Кветкі жоўтыя, духмяныя, адзіночныя або ў гронках. Плод — ягада. Вядома больш за 170 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы і Амерыцы. У СССР 15 відаў, у БССР адзін — Б. звычайны (B. vulgaris, нар. назвы: кіслец, кіслянка). Расце ў лясах, на палянах, па берагах рэк. Вырошчваецца як дэкаратыўны. Меданос. Плады багатыя на яблычную к-ту і вітаміны, выкарыстоўваюцца ў кандытарскай прамысл. Настой з лісця ўжываецца пры хваробах печані і ў акушэрска-гінекалагічнай практыцы. Б.— прамежкавы гаспадар іржаўнага грыба (Puccinia graminis) — паразіта збожжавых.

БАРБАЦЕР (франц. barboter літар. валтузіцца ў вадзе, у гразі), прыстасаванне ў выглядзе трубаў з маленькімі (3—6 *мм*) адтулінамі для прадзімання газу (паветра) ці пары праз слой вадкасці. Шырока выкарыстоўваецца ў хім. прамысловасці, калі трэба перамяшаць ці выпарыць вадкасць або насыціць газы парай.

БАРБАШОЎ Аляксандр Іпалітавіч (1858 — г. см. невяд.), рускі буржуазны гісторык, аўтар прац па гісторыі Вялікага княства Літоўскага. Скончыў гісторыка-філал. ф-т С.-Пецярбургскага ун-та. Выкладаў у сярэдніх навуч. установах С.-Пецярбурга. З 1886 магістр рус. гісторыі [дысертацыя «Вітаўт і яго палітыка да Грунвальданскай бітвы (1410 г.)», СПб., 1885]. Вывучаў унутраную і знешнюю палітыку *Вітаўта*, барацьбу літ., рус., бел. і ўкр. народаў супраць Тэўтонскага ордэна. Шырока выкарыстоўваў беларускалітоўскія летапісы.

Тв.: Танненбергская битва, «Журнал Министерства народного просвещения», 1887, ч. 254; Летописные источники для истории Литвы в средние века, СПб., 1888; Торнский мир, «Журнал Министерства народного просвещения», 1890, ч. 272; Витовт. Последние двадцать лет княжения 1410—1430, СПб., 1891 (Очерки литовско-русской истории XV в.). *С. А. Шчарбакоў.* Мінск.

БАРБАШЫН Яўген Аляксеевіч [4(17).1.1918, с. Уінск Асінскага пав. Пермскай губ.— 5.7.1969], савецкі матэматык. Акад. АН БССР (1966). У 1943—66 працаваў ва Уральскім політэхн. ін-це і Матэматычным ін-це АН СССР (Свярдлоўскае аддз.). З 1966 у Мінску, заг. лабараторыі прыкладной матэматыкі і механікі Ін-та матэматыкі АН БССР, арганізатар кафедры прыкладной матэматыкі ў БДУ. Даследаванні па дыферэнцыяльных ураўненнях, тапалогіі і сучасных праблемах прыкладной матэматыкі. У манаграфіях «Уводзіны ў тэорыю ўстойлівасці» (1967) і «Дынамічныя сістэмы з цыліндрычнай фазавай прасторай» (1969) Б. распрацаваў эфектыўныя спосабы пабудовы функцый Ляпунова, стабілізацыю сістэм з пераменнай структурай, устойлівасць пры імпульсных узбурэннях, пытанні тэорыі праграмнага рэгулявання і тэорыі фазавых дынамічных сістэм. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга і медалямі.



Літ.: Еругин Н. П. и Красовский Н. Н. Евгений Алексеевич Барбашин (к 50-летию со дня рождения), «Дифференциальные уравнения», 1967, т. 3, № 12 (бібліягр.).

БАРБ'Е (Barbier) Анры Агюст (29.4.1805, Парыж — 13.2.1882), французскі паэт. Сын адваката. Па адукацыі юрыст. У першым і асн. зб. «Ямбы» (1831), у якім адлюстраваны падзеі Ліпеньскай рэв. 1830, спалучаюцца сатыра на буржуа і сцвярджэнне рэвалюц. гераічнага пафасу. Афарбаваныя трагізмам выкрывальныя вершы Б. з іх алегарызмам і метафарычным стылем пачалі рамант. этап у грамадз. паэзіі Францыі. Тэма нац.-вызв. руху распрацавана ў цыкле элегій і санетаў «Плач» (1833) і ў санетах «Гераічныя сугучнасці» (1843). Перакладаў Дж. Бакачыо, У. Шэкспіра, С. Т. Колрыджа. Гераічны вобраз «багіні Свабоды» (верш «Сабачы баль») натхніў франц. мастака Э. *Дэлакруа* на стварэнне карціны «Свабода на барыкадах».

Тв.: Рус. пер.— Избр. стихотворения, М., 1953.
Літ.: Великовский С. И. Поэты французских революций. 1789—1848, М., 1963.


БАРБІЗОНСКАЯ ШКОЛА, група французскіх пейзажыстаў, якія працавалі ў вёсцы Барбізон у ваколіцах замка Фантэнбло ў 30—60-я г. 19 ст. (Т. *Русо*, Ж. Дзюпрэ, Н. Дыяз, Ш. Ф. Дабіньі, К. Траён, Ш. Жак,

Р. Банёр і інш.). Аснова іх метаду — пісанне пейзажаў непасрэдна з натуры. Насуперак акад. тэорыям яны адлюстроўвалі не мясціны, праслаўленыя прыгажосцю, а звычайныя куткі роднага краю ў розныя поры года і сутак. Каларыт пейзажаў Б. ш. ніякі, змякчаны карычневымі і шэрымі плямамі. На жывапісныя прыёмы Б. ш. зрабілі ўплыў пейзажы англ. мастака Дж. Констэбла і галандцаў 17 ст. Пейзаж Б. ш. адыграў вялікую ролю ў станаўленні рэаліст. кірунку франц. жывапісу 19 ст.

Літ.: Яворская Н. В. Пейзаж Барбизонской школы, М., 1962.

БАРБІТАЛ НАТРЫЮ (медынал, веранал), лякарства на сон і заспакаяльны сродак. Натрыевая соль барбіталу прыгнятае цэнтр. нервовую сістэму. Мала таксічны, лёгка выдзяляецца з арганізма. Дзейнічае хутка. Ужываецца ў таблетках або парашках. Назначаюць пры бяссонніцы, псіхічнай узбуджанасці.

БАРБЮС (Barbusse) Анры (17.5.1873, Аньер — 30.8.1935, Масква), французскі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Чл. ФКП з 1923. З сям'і літаратара. Вучыўся на літ. ф-це Сарбоны, дзе абараніў дысертацыю па філасофіі (1894). Быў журналістам. Літ. дзейнасць пачаў у сярэдзіне 90-х г. Зб. вершаў «Плакальшчыцы» (1895) — даніна моднай у той час дэкадэнцкай паэзіі. Пазней перайшоў на прозу. Рэаліст. тэндэнцыі адчуваюцца ў рамане «Пекла» (1908) і ў цыкле навел «Мы» (1914). Паваротны момант у жыцці і творчасці Б.— 1-я сусв. вайна, у якой ён добраахвотна ўдзельнічаў як салдат. Пісьмы з фронту да жонкі (1914—17, апубл. 1937) і асабліва раман «Агонь» (1916, Ганкураўская прэмія 1917) сведчаць пра развіццё рэвалюц. светапогляду пісьменніка. Кн. «Агонь» і «Яспасць» (1919), дзе з вялікай маст. сілай паказана абуджэнне рэвалюц. свядомасці салдатаў на франтах імперыялісц. вайны, высока ацэнены У. І. Леніным і М. Горкім. Пасля Кастр. рэв. рашуча выступіў у абарону Сав. дзяржавы («Мы абвінавачваем», 1919). У 1917 з П. *Вайян-Куцюр'е* і Р. Лефеўрам стварыў Рэсп. асацыяцыю былых удзельнікаў вайны, а ў 1919 міжнар. антываенную арг-цыю прагрэс. інтэлігенцыі «Клартэ», маніфестам якой стала кн. Б. «Святло з бездані» (1920). Узоры рэвалюц. публіцыстыкі — зб. «Словы барацьбіта» (1920) і «З нажом у зубах» (1921). Кн. «Каты» (1926) выкрывае злачынствы балг. і рум. фашыстаў на Балканах. Зб. апавяд. «Падзеі» (рус. пер. «Праўдзівыя аповесці», 1929; бел. пер. «Розныя факты», 1929) пра гераізм рэвалюцыянераў, ахвяр белага тэрору, вязняў фаш. катавальняў. Адзін з ініцыятараў Сусв. кангрэсу супраць імперыялісц. вайны (Амстэрдам, 1933) і Міжнар. кангрэсу пісьменнікаў у абарону культуры (Парыж, 1935). Няраз прыязджаў у СССР, выдаў дакумент. кн. «Вось што зроблена ў Грузіі» (1929), «Расія» (1930). Апошняя праца Б.— каментарыі да франц. пер. перапіскі У. І. Леніна з роднымі (1936).



Тв.: Бел. пер.— Расія (Уражанне з падарожжа), Мн., 1931.
Літ.: Колас Я. Памяці Анры Барбюса, Збор твораў, т. 11, Мн., 1964; Анри Барбюс. Библиогр. указатель, М., 1964. *Б. П. Міцкевіч.* Мінск.

БАРВЕНАК, барвінак (Vinca), род вечназялёных травяністых раслін сямейства кутравых. Сцябло лежачае, даўж. да 60 *см*. Лісце эліпсоіднае, скурыстае, бліскучае. Кветкі сінія або фіялетавыя. Плод — дзве лістоўкі з 6—8 калівамі насення. Вядома 7 відаў, пашыраных у Еўропе і Зах. Азіі. У СССР 5, у БССР 2: Б. малы (V. minor) і Б. травяністы (V. herbacea). Расце ў лясах, гаях, вырошчваюць як дэкар. расліну. Ёсць формы з махрыстымі кветкамі. Б. малы — ядавітая расліна, мае алкалоіды (віпкамін, пубесцын, мінарын), якія дзейнічаюць гіпатэнзіўна (зніжаюць крывяны ціск). Прэпараты з Б. ўжываюцца ў медыцыне.

Барвенак малы.

БАРДЗІЛАЎКА, вёска ў Кайкаўскім с/с Мінскага р-на. Цэнтр калгаса «Расія». За 28 *км* на Пд ад Мінска, 5 *км* ад чыг. ст. Міханавічы. 387 ж., двароў 143 (1970). Сярэдняя школа, б-ка. Вёска была спалена нямецка-фаш. захопнікамі.

БАРДЗІН Іван Паўлавіч [1(13).11.1883, в. Шырокі Уступ Саратаўскай губ.— 7.1.1960], савецкі вучоны-металург. Акад. АН СССР (1932). Герой Сац. Працы (1945), віцэ-прэзідэнт АН СССР (1942—60). У 1910 скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т. Працаваў на металург. з-дах ЗША (1910—11) і Поўдня Расіі. З 1917 кіраваў аднаўленнем айчыннай металург. прамысловасці. Да 1929 галоўны інжынер Яканеўскага, Макееўскага і Днепрадзяржынскага металург. з-даў. У 1929—32 кіраваў буд-вам Кузнецкага металург. камбіната. З 1939 дырэктар Ін-та металургіі АН СССР, з 1944 — Цэнтральнага НДІ чорнай металургіі. Працы Б.— пра стварэнне магутных металург. з-даў, інтэнсіфікацыю металург. пра-





цэсаў, асваенне бесперапыннай разліўкі сталі ў крышталізатарах. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—5-га скл. Чл. шэрагу замежных АН. Узнаг. 7 ордэнамі Леніна. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1949; Ленінская прэмія 1958.

Літ.: Проблемы металлургии [Академику И. П. Бардину к семидесятилетию], М., 1953 (ёсць бібліягр. прац Б. і літ. пра яго).

БАРДЗІНА Соф'я Іларыёнаўна [1853—14(26).4.1883], руская рэвалюцыянерка-народніца. Вучылася ў Цюрыху, Жэневе. У 1874 вярнулася ў Расію, вяла рэвалюц. прапаганду сярод рабочых. Арыштавана ў 1875. На «працэсе 50-ці» (1877) засуджана на 9 гадоў катаргі, заменены вечнай ссылкай у Сібір, адкуль уцякла ў 1880 і пасялілася за мяжой. Прамова Б. на судзе, поўная веры ў немінучасць рэвалюцыі ў Расіі, друкавалася ў падпольных выданнях. Цяжкая хвароба прывяла яе да самагубства.

БАРДО (Bordeaux), горад на ПдЗ Францыі, адм. цэнтр дэпартамента Жыронда. Порт на р. Гарона (98 *км* ад Атлантычнага ак.), даступны марскім суднам. Чыг. вузел. 266,7 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1968). Суднабудаванне, металаапрацоўка; хім., дрэваапр., харчовая (кансервы, віно), нафтаперапр., тэкст. прамысловасць.

Планіроўка і цэнтр. ансамблі — эпохі класіцызму (18 — пач. 19 ст.): плошча Камедыі з Вялікім тэатрам (1773—80, арх. В. Луі), Круглая плошча і алеі Турні (1744—48), плошча Кенконс (1818—28), адкрытая на раку, і набярэжная з плошчамі Жарэса, Бір-Хакем, Біржы (1728—55, арх. Ж. А. Габрыэль). З больш ранняй забудовы вылучаюцца сабор Сент-Андрэ (12—15 ст.), цэрквы Сен-Сёрэн, Сент-Элуа, Сен-Мішэль і інш., вароты Вялікага звона, ратуша, шматлікія атэлі і дамы, універсітэцкія факультэты. Вялізныя новыя раёны (Бенож і інш.) забудаваны ў 1950—60 з абодвух бакоў р. Гароны. У Б. ун-т, Акадэмія навук і мастацтваў.

БАРДОСКАЯ ВАДКАСЦЬ, фунгіцыд, сумесь раствору меднага купарвасу $CuSO_4 \cdot 5H_2O$ і вапнавага малака $Ca(OH)_2$. Вадкасць блакітнага колеру, нейтральнай або слабашчолачнай рэакцыі. Рыхтуецца ў драўляным посудзе. Выкарыстоўваецца супраць узбуджальнікаў грыбковых хвароб у раслін (паршы яблынь і груш, мільдзью вінаграду, фітафторы бульбы і памідораў, антракнозу агуркоў і інш.). Каб адначасна знішчыць інш. шкоднікаў, да Б. в. дадаюць парыжскую зелень, анабазін-сульфат або інш. ядахімікаты. Пры апырскванні наземнымі машынамі ў залежнасці ад культуры расходуюць 500—800 *л/га* 1% воднага раствору Б. в.; пры апырскванні з самалётаў выкарыстоўваюць 3% раствор (200—300 *л/га*).

БАРДУНОЎ Віктар Мікалаевіч (н. 24.9.1920, г. Харкаў), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1939. На фронце з 1941. Вызначыўся 28.6.1944 пры ліквідацыі варожай засады на зах. беразе р. Пліч каля в. Козел Палескай вобл. Сяржант Б. замяніў камандзіра ўзвода, які загінуў у баі, імклівай атакай і абходным манеўрам прымусіў ворага ўцякаць і прычыніў яму значныя страты. Жыве ў Харкаве.

БАРДЫШАЎ Іван Іларыёнавіч [н. 1(14).7.1912, с. Рускія Нарвашы Казанскай губ.], беларускі савецкі хімік. Чл.-кар. АН БССР (1959), д-р хім. н. (1953), праф. (1955). У 1954—63 заг. кафедры хіміі Бел. лесатэхн. ін-та, з 1954 заг. лабараторыі хіміі тэрпенаў Ін-та фізіка-арганічнай хіміі АН БССР. Асн. навук. працы ў галіне хіміі тэрпенаў: вызначэнне хім. саставу тэрпеноідаў, атрыманых з хвойных парод СССР; вывучэнне хім. ператварэнняў монатэрпенавых і дытэрпенавых злучэнняў; распрацоўка новых метадаў аналізу тэрпеноідаў і спосабаў атрымання новых лесахім. прадуктаў і рэактываў. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



БАР'ЁРНАЯ ФУНКЦЫЯ, здольнасць арганізма чалавека і жывёл праз своеасаблівыя фізіялагічныя механізмы, т. зв. бар'еры, абярагаць адносна пастаяннай хім. састаў і біял. ўласцівасці ўнутранага асяроддзя (крыві, тканкавай і ўнутрымазгавой вадкасці). Фізіял. бар'еры засцерагаюць арганізм ад некат. вонкавых уздзеянняў.

Як і інш. прыстасавальныя ўласцівасці арганізма, Б. ф. выпрацаваліся ў працэсе эвалюцыі. Адрозніваюць вонкавыя і ўнутраныя (тканкавыя) бар'еры. Вонкавыя — скура, органы дыхання, стрававання, выдзялення — забяспечваюць пастаянны хім. састаў крыві і ахоўваюць яе ад пападання шкодных рэчываў з вонкавага асяроддзя. Праз унутраныя бар'еры ў тканкавую і ўнутрымазгавую вадкасць выбарачна трапляюць неабходныя для жыўлення клетак рэчывы і выводзяцца прадукты клетачнага абмену. З вонкавых бар'ераў важнае значэнне мае т. зв. пячоначны бар'ер, які забяспечвае абясшкоджанне некат. ядавітых злучэнняў, якія трапляюць з ежай або ўтвараюцца ў кішэчніку. Адчувальнасць арганізма да бактэрый, ядаў і таксінаў значна залежыць ад стану яго бар'ераў. Б. ф. рэгулююцца нервовай сістэмай. Пранікальнасць бар'ераў можа мяняцца пры паталагічных працэсах, розных вонкавых уздзеяннях на арганізм і г. д. Парушэнні дзейнасці бар'ерных сістэм арганізма спрыяюць развіццю хвароб. У распрацоўку праблемы Б. ф. значны ўклад зрабілі сав. вучоныя І. П. Паўлаў, Л. С. Штэрн, А. А. Багамолец і інш.

Літ.: Гисто-гематические барьеры, под ред. Л. С. Штерн, М., 1961; Кассиль Г. Н. Гематоэнцефалический барьер, М., 1963.

А. А. Крыўчык. Мінск.

БАРЖА (франц. barge ад лац. baris лодка), судна для перавозкі грузаў з дапамогай буксіраў ці штурхачоў (несамаходная Б.) або рухавікоў унутранага згарання (самаходная Б.) па рэках, азёрах, морах і ў портах. Бываюць наліўныя і сухагрузныя (грузападымальнасць рачной наліўной Б. дасягае 12 000 *т*). Будуюцца з дрэва, сталі і жалезабетону. У БССР Б.-пляцоўкі грузападымальнасцю да 300 *т* выпускаюць Рэчыцкая суднаверф і Віцебскія суднарамонтныя майстэрні.

БАРЖОМСКАЯ ГРУПА КУРОРТАЎ, бальнеалагічныя і кліматычныя курорты ў далінe ракі Куры ў Грузінскай ССР. Баржомі — курорт побач з чыг. ст. Баржомі, за 149 *км* ад Тбілісі. На гарах хвойныя лясы. Мяккая зіма, цёплае лета. У канцы вясны і ў пач. лета хмарнае дажджлівае надвор'е. Лекавыя сродкі: вуглякіслыя гідракарбанатна-патрыевыя крыніцы, вада з іх выкарыстоўваецца на піццё і на ванны. Лечаць ад хвароб страўнікава-кішачнага тракту і парушэнняў абмену рэчываў. Сезон — цэлы год. Добра абсталяваныя санаторыі, дамы адпачынку, гасцініца, фізіятэрапеўтычная лячэбніца, ванны, грязелячэбніца. Курорты Цэмі, Цагверы — лячэнне ад хвароб органаў дыхання нетуберкулёзнага паходжання. Лібані, Патара-Цэмі, Абастумані — лячэнне туберкулёзных хворых. Б. г. к. звязана Баржомска-Бакурыянскай вузкакалейкай.

Літ.: Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967.

Я. Ф. Калітоўскі. Мінск.

БАРЗДОЎКА, вёска ў Браздзетчынскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл., на р. Крапівенка (прыток Дняпра). Цэнтр калгаса імя Куйбышава. За 18 *км* на ПдУ ад Оршы, 112 *км* ад Віцебска, 19 *км* ад чыг. ст. Орша, на шашы Орша — Горкі. 247 ж., двароў 88 (1970). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, магазін, швейная майстэрня. Брацкая магіла сав. воінаў.

БАРКА (барка беларуская), старадаўняе судна для сплаву грузаў па рэках і каналах на Беларусі і ў заходніх р-нах Расіі. Асаблівасць Б. — плоскае днішча, тупы круглы нос, адвесныя бакі. Б. былі адна-, дзвюх- і трохмачтавыя. Даўж. 20—50 *м*, шыр. каля 15 *м*, грузападымальнасць да 10 тыс. пудоў. Найчасцей будавалася без цвікоў і выкарыстоўвалася толькі адзін раз — на перавозку грузаў па цячэнні, пасля разбіралася на будаўнічы лес ці дровы. Па Дняпры, Прыпяці, Бярэзіне, Зах. Дзвіне і па рэках Расіі на Б., а таксама *віцінах* сплаўляліся грузы да канца 19 ст., пакуль не з'явіліся буксірныя баржы. У басейне Зах. Дзвіны падобнае судна называлася *стругам*.

БАРКАЛАБАВА (Баркулабава), вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя К. Лібкнехта. Прыстань на Дняпры. За 14 *км* на Пн ад Быхава, 35 *км* ад Магілёва, 3 *км* ад чыг. раз'езда Баркалабава. 596 ж., гасп. 170 (1970). Сярэд. школа, клуб, б-ка, 2 бальніцы, аддз. сувязі, магазін, швейная майстэрня. Б. вядома гістар. помнікамі і знаходкамі. На паўд. ускраіне, пры ўпадзенні Стругі ў Дняпро, гарадзішча мілаградскай, зарубінецкай, штрыхаванай керамікі культур і эпохі Кіеўскай Русі. Даследавалася А. Дз. Каваленем, Ю. У. Кухарэнкам, Л. Д. Побалем і інш. Яго пляцоўка мае форму, блізкую да трохвугольніка, памер 95 *м* × 58 *м*, вышыня над поймай 13 *м*. У эпоху бронзы тут была стаянка чалавека. У час Кіеўскай Русі на гэтым месцы пабудавана ўмацаванае паселішча. Пры раскопках знойдзены кераміка, вырабы з бронзы, жалеза; у ранейшых пластах — вырабы з крэменю і бронзы. Цікавая знаходка — бронзавы завушнік балт. тыпу. У манастыры Б. знойдзены выдатны помнік бел. гісторыі і л-ры сярэдніх вякоў — *Баркулабаўскі летапіс*.

Літ.: Каваленя А. З. Археалагічныя разведкі ў Магілёўскай, Бабруйскай і Мінскай акругах, «Працы археалагічнай камісіі Беларускай АН», 1930, т. 2.

Л. Д. Побаль. Мінск; *Д. М. Абрамовіч.* Быхаўскі р-н.

БАРКАРОЛА (італьян. barcarola ад barca лодка), лірычная песня лодачніка; бытавы муз. жанр, характэрны Венецыі. Тэмп памяркоўны, памер 6/8 або 12/8. Многія кампазітары называюць Б. вакальныя ці інстр. п'есы з плаўнай пявучай мелодыяй і аднастайным акампанементам, які імітуе ўсплёскі хваль. Вядомыя, напр., Б. для голасу і фп. М. Глінкі, Ф. Шуберта, фартэпіянныя — Ф. Мендэльсона, Ф. Шапэна, П. Чайкоўскага. Тое самае значэнне мае слова «гандальера».

БАРКАС (гал. barkas), 1) тып суднавай шлюпкі даўжынёй 9—12 *м*. 2) Рачная *барка* грузападымальнасцю 20—100 *т*. 3) Дапаможны пара- ці цеплаход, які буксіруе судны ў порце і на ўнутрыпартовых перавозках. 4) Апарат гарбарнай вытворчасці для перамешвання скур у вадкасці.

БАРКІ, вёска ў Старасельскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Уперад». За 27 *км* на Пн ад Шклова, 67 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Копысь. 158 ж., двароў 59 (1970). Васьмігадовая школа. Радзіма Героя Сав. Саюза лётчыка М. А. *Карначонка*.

БАРКЛАЙ ДЭ ТОЛІ Міхаіл Багданавіч [1761—14(26).5.1818], рускі палкаводзец. Герой Айч. вайны 1812. Выхадзец з шатландскага роду, які ў 17 ст. перасяліўся ў Прыбалтыку. Удзельнічаў у войнах: руска-турэцкай 1787—91 (штурм Ачакава, узяцце Акермана і Бендэраў), руска-шведскіх 1788—90 і 1808—09 і кааліцыйных супраць напалеонаўскай Францыі, а таксама ў разгроме паўстання Т. Касцюшкі ў 1794 (пры ўзяцці штурмам Вільні і знішчэнні атрада Грабоўскага каля Гродна). У 1809 прызначаны ген.-губернатарам Фінляндыі і галоўнакамандуючым фінляндскай арміі. Са студз. 1810 да вер. 1812 ваенны міністр. Умацаваў рус. армію, удвая павялічыў яе колькасць, удасканаліў арганізацыю, стварыў новыя крэпасці, у т. л. на тэр. Беларусі (Бабруйская). У пач. Айч. вайны 1812 камандаваў 1-й Зах. арміяй, як міністру яму падпарадкоўвалася і 2-я армія П. І. Багратыёна. Улічваючы колькасную перавагу напалеонаўскай арміі, Б. дэ Т. паабягаў рашучых баёў і адводзіў рус. войскі ўглыб краіны. Толькі такая тактыка была правільная ў тых умовах, але гэта выклікала нездаволенасць у арміі і афіц. колах. 17.8.1812 перадаў камандаванне М. І. Кутузаву. У *Барадзінскай бітве 1812* камандаваў правым крылом і цэнтрам



рус. арміі, паказаў майстэрства ў кіраванні войскамі і асабістую мужнасць. У лют. 1813 прызначаны камандуючым 3-й арміі, а ў маі 1813 галоўнакамандуючым руска-прускіх войск. У 1814 за ўдзел ва ўзяцці Парыжа атрымаў званне ген.-фельдмаршала, у 1815 — тытул князя. Вярнуўшыся ў Расію, камандаваў 1-й арміяй. Памёр у Інстэрбурзе (Усх. Прусія); астанкі перавезены ў яго маёнтак Беклор у Ліфляндыі. У Ленінградзе помнік Б. дэ Т. (скульптар Б. І. Арлоўскі).

Літ.: Маркс К. Барклай де Толли, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 14; Бантыш-Каменский Д. Н. Биографии российских генералиссимусов и генерал-фельдмаршалов, ч. 3, СПб., 1840; Харкевич В. И. Барклай де Толли в Отечественную войну после соединения армий под Смоленском, СПб., 1904.

БАРКОЎ Міхаіл Іванавіч [н. 8(21).11.1916, в. Рэп'ева Томскага пав.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1945. Вызначыўся 25.6.1944 пры фарсіраванні Зах. Дзвіны каля в. Уврэча Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Наводчык Б. з разлікам гарматы пабудаваў плыт, на ім пад абстрэлам ворага фарсіраваў раку, захапіў і пашырыў плацдарм, гэтым садзейнічаў паспяховай пераправе ўсяго падраздзялення. Жыве ў Брацку.

БАРКОЎСКАЯ Вера Іосіфаўна (н. 8.3.1928, в. Курганы Бабруйскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1966. Працоўную дзейнасць пачала ў 1946 у калгасе «Радзіма» Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. У 1961—66 звеннявая, з 1966 брыгадзір паляводчай брыгады калгаса.

БАРКОЎСКІ Віктар Іванавіч [н. 6(18).1.1900, Мінск], савецкі мовазнавец. Чл.-кар. АН СССР (1958), д-р філал. н. (1950), праф. (1930). Чл.-кар. Германскай АН у Берліне (ГДР, 1967), Акадэміі навук і л-ры ў Майнцы (ФРГ, 1969), ганаровы д-р філасофіі (ГДР, 1967). Чл. КПСС з 1947. З сям'і выкладчыка. Скончыў гістор.-філал. ф-т Петраградскага універсітэта (1923). Даследчык гістар. граматыкі і дыялекталогіі ўсх.-слав. моў. Аўтар прац аб мове Суздальскага летапісу і наўгародскіх грамат на бяросце, па гісторыі вывучэння бел. мовы, навук.-біягр. артыкулаў пра акад. Я. Карскага, рэд. яго твораў «Беларусы» (2 выд., в. 1—3, 1955—56) і «Працы па беларускай і іншых славянскіх мовах» (1962). Узнаг. ордэнам Леніна.



Тв.: Синтаксис древнерусских грамот, [ч. 1—2], М. — [Львов], 1949—58; Использование диалектных данных в трудах по историческому синтаксису восточнославянских языков, М., 1958; Сравнительно-исторический синтаксис восточнославянских языков. Типы простого предложения, М., 1968.

БАРКОЎСКІ Сямён Даямідавіч [н. 10(23).5.1916, в. Курганы Бабруйскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1943. У 1933—36 працаваў у калгасе «Чырвоныя Курганы» бухгалтарам, потым старшынёй. З 1937 у Чырв. Арміі; скончыў Вільнюскае пяхотнае вуч. (чэрв. 1941). З жн. 1941 камандзір партыз. групы ў Віцебскай вобл., з мая 1942 камандзір разведкі, пам. камандзіра партыз. атрада № 537, в чэрв. 1943 камандзір *партызанскага палка № 537* Магілёўскай вобл. Узнаг. ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў Бабруйску.



БАРКОЎСКІ Яўген Нічыпаравіч [н. 14(27).8.1910, Вільня], савецкі ваенны дзеяч. Ген.-л. інж.-тэхн. службы (1968). Беларус. З рабочых. Чл. КПСС з 1931. З 1928 працаваў у Гомелі слесарам паравозарамонтнага з-да. З снеж. 1932 у Ваен.-Марскім Флоце. Скончыў Ваен.-транспартную акадэмію (1939). У Айч. вайну на Чарнаморскім і Паўн. флотах, нач. інжынернай службы ваен.-марской базы. Удзельнік абароны Севастопаля, Запаляр'я. Служыць у ВМФ. Узнаг. 5 ордэнамі, медалямі.

БАРКУЛАБАЎСКІ ЛЕТАПІС, помнік беларускай гістарычна-мемуарнай літаратуры 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. Напісаны ў в. Баркулабава *(Баркалабава)* Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл., ахоплівае перыяд 1545—1608. Сістэматычнае апісанне падзей пачынаецца з 1564 — з моманту заснавання Баркулабам Іванавічам Корсакам вёскі і замка, названых яго імем. Побач з запатоўкамі пра жыццё Баркулабава і яго ваколіц аўтар уключыў у летапіс дзярж. і прыватныя дакументы, лісты, успаміны інш. асоб, нар. легенды і паданні. У летапісе багаты матэрыял пра жыццё сялян, побыт, звычаі, настроі і імкненні простых людзей, пра міграцыі насельніцтва, цэны на с.-г. прадукты і інш. Асабліва багатыя па бытавыя дэталі і цікавыя з маст. боку замалёўкі неўраджайных і галодных гадоў пач. 17 ст. У Б. л. апісаны і падзеі грамадска-паліт. і рэліг. жыцця канца 16 — пач. 17 ст. (дзейнасць запарожскіх казакоў, царкоўных брацтваў, руска-польскія ўзаемаадносіны). Аўтар асуджаў ваенныя канфлікты і войны, адмоўна ставіўся да казакоў, да ўвядзення новага грыгарыянскага календара (1583). Усе падзеі разглядаліся аўтарам толькі з пазіцый таго, як гэта адбівалася на дабрабыце простага люду. Самабытная, жывая гутарковая мова таго часу, спецыфічнае па адборы матэрыялаў і высокамастацкае па стылі і сродках моўнай выразнасці адлюстраванне будняў тагачаснага сялянскага жыцця ставяць Б. л. у шэраг найвыдатнейшых помнікаў бел. нац. культуры. Арыгінал Б. л. зберагаецца ў Дзярж. гістар. музеі ў













Барока. 1. Ф. Бараміні. Царква Сан-Карла але Куатра Фантане. Рым. 1634—67. 2. В. В. Растрэлі. Сабор Смольнага манастыра. Ленінград. Пачаты ў 1748. 3. Езуіцкі касцёл у Гродне. 1667. 4. Л. Бернініі. Экстаз св. Тэрэзы. Фрагмент алтара св. Тэрэзы ў капэле Карнара царквы Санта-Марыя дэла Віторыя. Рым. 1644—52. 5. Г. Гварыні. Капэла Санта-Сіндоне сабора ў Турыне. 1668—94. 6. Л. Бернініі. Людовік XIV. 1665. 7. П. П. Рубенс. Выкраданне дачок Леўкіпа. 1619—20. 8. К. Б. Растрэлі. Пётр I. 1723.










Батлейка. 1. Адам і Ева. 2. Віцебскі жлоб. 18 ст. 3. Войска цара Ірада. Лялькі ценявога тэатра. 4. Чорт. Паніч. 5. Ельнінскі вяртэп. 18—пач. 19 ст. 6. М. А. Блішч. Батлейка. 1962. 7. Іосіф і Марыя. 8. Антон з казой. Антоніха. 9. Магілёўская батлейка. 2-я пал. 19 ст. 10. Васіль з доўбняй. Цыган.



Старонка з Баркулабаўскага летапісу. 17 ст.

Маскве (Сінадальны збор № 790, л. 137—175). Назву даў першы выдавец летапісу П. А. Куліш.

Публ.: Кулиш П. А. Материалы для истории воссоединения Руси, т. 1. 1578—1630, М., 1877, с. 45—89; Баркулабовская летопись, под ред. М. В. Довнар-Запольского, «Университетские известия», Киев, 1898, № 12, с. 1—38; Варкалабовская летопись, у зб.: Сборник статей «Могилевских губернских ведомостей», под ред. Е. Р. Романова, в. 1, 1898 и 1899 гг., Могилев, 1900; Варколабовская летопись, под ред. Е. Р. Романова, у кн.: Памятная книжка Виленской губернии на 1910 год, ч. 3, Вильна, 1910, с. 1—52.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 260—268; Чамярыцкі В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў. Мн., 1969. *А. Ф. Коршунаў.* Мінск.

БАРКУН, буркун (Melilotus), род аднаабо двухгадовых траў сямейства матыльковых. Сцябло галінастае, выш. 15—150 *см*. Лісце трайчастае, з дробных пілаватазубчастых лісточкаў. Кветкі паніклыя, белыя або жоўтыя ў пазушных гронках. Плод — сеткавы струк. Вядома 20 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы. У СССР 11 відаў, у БССР 2: Б. белы (M. albus, нар. назвы: свінуха, папоўнік) і Б. лекавы (M. officinalis, нар. назвы: баркун жоўты, маляснік, томка). Растуць на лугах, палях, каля дарог. Каштоўныя кармавыя травы. Добрыя меданосы. Маюць вітамін С, духмянае рэчыва кумарын. Б. лекавы змяшчае мелілотавую і кумарынавую к-ты, гліказід мелілатазід, эфірны алей. З яго травы робяць мелілатны (зялёны) пластыр.



Баркун белы.

Ужываецца ў нар. медыцыне. Кумарын выкарыстоўваецца для араматызацыі тытуню і ў парфумерыі.

БАРКУСЕВІЧ Сігізмунд Іосіфавіч (28.12.1891, Пецярбург — 6.9.1930), удзельнік рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны, дзяржаўны дзеяч БССР. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Пецярбургскую ваенна-фельч. школу, вучыўся на мед. ф-це БДУ. У рэвалюц. рух уключыўся з 1911, удзельнічаў у студэнцкіх, рабочых і салдацкіх гуртках і ў забастоўках. У час Кастр. рэвалюцыі камісар 1-га чырвонагвардзейскага корпуса, пасля працаваў у Наркамаце замежных спраў РСФСР, заг. Тамбоўскага павятова-гарадскога і Гродзенскага губ. аддзелаў аховы здароўя. З канца 1920 нам. наркома аховы здароўя БССР, старшыня праўлення т-ва Чырв. Крыжа БССР, адзін з арганізатараў і ваенны камісар мед. ф-та БДУ, чл. праўлення БДУ. З крас. 1924 у Наркамаце замежных спраў СССР.

БАРМА (16 ст.), рускі дойлід. У 1555—60 з І. Поснікам стварыў у Маскве на Краснай плошчы унікальны помнік сусв. значэння — *Васіля Блажэннага храм*.

Літ.: Брунов Н. И. Мастера древнерусского водчества, М., 1953.

БАРМІН Уладзімір Паўлавіч [н. 4(17).3.1909, Масква], савецкі вучоны ў галіне механікі. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. з 1958). Чл. КПСС з 1944. Герой Сац. Працы (1956). У 1930 скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вуч. З 1931 выкладчык, праф. (1959) гэтага вуч. У 1940—46 гал. канструктар з-да «Кампрэсар». Асн. працы па кампрэсарабудаванні, халадзільнай тэхніцы, машынабудаванні, механіцы. Адкрыцці і вынаходствы ў галіне механікі і машынабудавання. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1967. Ленінская прэмія 1957. Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, інш. ордэнамі, медалямі.



БАРМЫ (**наплечнікі**), частка княскага або царскага ўбору для ўрачыстых выхадаў. Упрыгожвалі залатым шытвом, абразамі святых і каштоўнасцямі. Упершыню ўпамінаюцца ў летапісе пад 1216. З 1498 у Рус. дзяржаве Б. карысталіся пры каранацыі, у 18 ст. іх замянілі імператарскай мантыяй.

БАРН, адзінка вымярэння эфектыўнага папярочнага сячэння ядзерных працэсаў, роўная 10^{-24} *см*^{2}. Ужываюцца і долевыя адзінкі: мілібарн (10^{-27} *см*^{2}) і мікрабарн (10^{-30} *см*^{2}).

БАРНАУЛ, горад краявога падпарадкавання, цэнтр Алтайскага краю РСФСР. Прыстань на р. Об, чыг. вузел, аэрапорт. 439 тыс. ж. (1970). Прамысловасць: энергетычнае і транспартнае машынабудаванне (паравыя катлы, дызель-маторы, вагоны), станкабудаванне, вытв. мех. прэсаў; тэкстыльная (2 баваўняныя

камбінаты), хімічнай (з-ды штучнага валакна), лесапільная, гарбарная, аўчынная, валюшпая. ЦЭС. Ін-ты: політэхнічны, с.-г., мед., пед., філіялы ўсесаюзных завочных ін-таў (тэкстыльнага, фінансава-эканам.) і Томскага ун-та (юрыдычны ф-т), 12 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Тэатры: драматычны і юнага гледача. Краязнаўчы музей. Б. засн. ў 1744.

БАРНІТ (ад прозвішча аўстр. мінералога І. Борна), **стракатая медная руда**, мінерал, сульфід медзі і жалеза Cu_5FeS_4. У Б. да 69% медзі. Крышталі кубічнай сістэмы, трапляюцца рэдка. Звычайна ў суцэльных зярністых масах. Колер ад медна-чырвонага да бурага са стракатай сіняй пабегласцю. Цв. 3; шчыльн. 4300—5200 *кг/м*³. Трапляецца ў зонах другаснага абагачэння медных сульфідных радовішчаў, а таксама ў гідратэрмальных рудах. Кашт. медная руда. Радовішчы ў СССР (Урал, Казахстан), ГДР, ЗША.

БАРОВАЯ, вёска ў Вепрыскім с/с Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Сцяг». За 25 *км* на ПдУ ад Чэрыкава. 109 *км* ад Магілёва, 52 *км* ад чыг. ст. Крычаў. 367 ж., гаспадарак 111 (1970). Пач. школа, б-ка. У Айч. вайну ням. фашысты загубілі 68 жыхароў Б.

БАРОГРАФ, гл. *Метэаралагічныя прылады*.

БАРОДАЎКІ, дабраякасныя пухлінападобныя невялікія нарасты на скуры, якія ўзнікаюць ад разрастання сасочкавага і рагавога яе слоя. Бываюць простыя, плоскія, востраканцовыя і старэчыя. Выклікаюцца вірусам, які перадаецца пры кантакце і праз рэчы.

Простыя Б. — жаўтавата-шэрыя вузельчыкі на кісцях, пальцах рук, падэшвах ступняў; плоскія — дробныя вузельчыкі на твары, руках; востраканцовыя Б. — сасочкападобныя вузельчыкі ў складках скуры; старэчыя — шаравата-жоўтыя нарасты на скуры жывата, спіны, грудзей. Прафілактыка: выкананне правілаў асабістай гігіены, недапушчэнне парэзаў, драпін. Лячэнне: прыпальванне кіслотамі, змазванне вадкасцю Гардзеева, антывіруцытнай пастай, дыятэрмакаагуляцыя, аўтагематэрапія, вітаміны А, B_{12}, прэпараты ртуці, мыш'яку, рэнгенатэрапія і хірург. выдаленне. Самалячэнне можа прывесці да раку скуры.

Літ.: Машкиллейсон Л. Н. Инфекционные и паразитарные болезни кожи, М., 1960.

А. П. Комаў.

БАРОДЗІЧЫ, вёска ў Зэльвенскім с/с Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл., каля р. Зальвянкі (2 *км*). Цэнтр калгаса імя Леніна. Чыг. ст. на лініі Баранавічы — Ваўкавыск. За 1,5 *км* на ПнЗ ад Зэльвы, 130 *км* ад Гродна, на шашы Зэльва — Масты. 949 ж., двароў 363 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Ням. фашысты загубілі 17 жыхароў Б. На Кургане Бессмяротнасці помнік-абеліск і мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 42 сав. воінаў і партызан Айч. вайны.

БАРОК, вёска ў Сярэднікаўскім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл., на р. Лакнея. Цэнтр калгаса імя Будзённага. За 20 *км* на ПнЗ ад Слуцка, 125 *км* ад Мінска, 3 *км* ад чыг. ст. Сярэднікі. 504 ж., двароў 140 (1970). Млын, пільня, шавецкая майстэрня, майстэрня для рамонту тэхнікі. Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

БАРОКА (ад італьян. barocco літар. вычварны, дзіўны), стыль, які атрымаў развіццё ў еўрапейскім мастацтве 17 — 1-й пал. 18 ст. Звязана з дваранскай культурай часоў росквіту абсалютызму і барацьбой за нац. адзінства ў шэрагу еўрап. краін.

Б. зарадзілася ў Італіі ў 2-й пал. 16 ст. Найвышэйшага росквіту дасягнула ў Рыме ў 1-й і 2-й трэці 17 ст. (т. зв. Высокае італьян. Б., прадстаўнік Л. *Берніні*). Пашырылася ў Іспаніі, Цэнтр. Еўропе, Лац. Амерыцы. З канца 17 ст. цэнтр Б. — Вена. Складанае і суперэчлівае мастацтва Б., закліканае ўслаўляць пануючы клас і царкву, несла ў сабе новае ўяўленне пра арх. прастору, яе разнастайнасць, бязмежнасць і зменлівасць. Гэта адбілася на характары палацавых і паркавых ансамбляў, цэркваў з дынамічнай пабудовай мас, крывалінейнасцю абрысаў, маштабнасцю, перакананнем адных аб'ёмаў у другія. Пашыранаму дэкар. жывапісу (як і скульптуры) уласцівы драматызм, перавялічаны пафас, павышаная эмацыянальная, дынамічнасць кампазіцыі, кантрасты аб'ёмаў, святлоценевыя і колеравыя эфекты, імкненне стварыць ілюзію бязмежнай прасторы. Рус. Б. развілося ў 1-й пал. 18 ст. Дастасаванне тэрміна Б. да рус. архітэктуры канца 17 ст. («Нарышкінскае Б.») умоўнае. Росквіт рус. Б. (сярэдзіна 18 ст., творчасць В. *Растрэлі*, С. Чавакінскага і інш.) адлюстраваў агульнанацыянальны ўздым, спароджаны пятроўскімі рэформамі. У архітэктуры яно звязана з вялікімі горадабудаўнічымі работамі, грандыёзнымі ансамблямі, вялікімі будынкамі, у жывапісе і скульптуры — з пакаваам чалавека-дзелча.

Для архітэктуры барока Беларусі канца 16—17 ст. характэрныя прастата аб'ёмаў будынка, спалучэнне маляўнічага сілуэта з строгімі формамі крапасной архітэктуры, сумяшчэнне традыц. барочнага дэкору з мясц. сюжэтамі, сувязь з нар. дойлідствам. Спалучэнне масіву сцяны са скупой пластычнай распрацоўкай — своеасаблівая рыса бел. барока ў яго пач. стадыі развіцця. На абліччы каталіцкіх касцёлаў уплывалі ўзоры барока Паўн. Італіі. У архітэктуры праваслаўных цэркваў відаць сувязь з дойлідствам Украіны і Расіі. З 30-х г. 18 ст. на Беларусі пачынаюць будаваць храмы, якія вызначаюцца лёгкасцю і ажурнасцю мас, ускладненым сілуэтам, пышнасцю і багаццем арх. дэкору: цэнтр. фасады касцёлаў, створаных у стылі т. зв. «віленскага барока», упрыгожваліся складанымі разьбянымі шчытамі ці стройнымі выцягнутымі шмат'яруснымі вежамі (завершанымі шлемамі), скрыўленымі антаблементамі, ламанымі паясамі профіляў, пучкамі калон і пілястраў.

Сярод помнікаў Б. 16—17 ст. каталіцкія касцёлы: езуітаў у Нясвіжы (1584—93) і Гродне (1647—63, купал і верхавіны вежаў перабудаваны ў 18 ст.), бернардынаў (пачаты ў 1639, капліцы 1668 і 1750) і бернардынак (закончаны ў 1670) у Слоніме, брыгітак (1642—51) у Гродне і інш. Праваслаўныя цэрквы: Петрапаўлаўская (пачата з 1612) у Мінску, Ільінская (1643) і Троіцкая Маркава манастыра (1689—91) у Віцебску, Успенскі сабор Куцеінскага жаночага манастыра каля Оршы (1631—35). Багаяўленскі сабор брацкага манастыра (1636) і ц. Мікалая ў Магілёве (1669—72) і інш. Сярод помнікаў 18 ст. ў стылі «віленскага барока» касцёлы: кармелітаў у Глыбокім (1735), св. Сафіі (1738—50, перабудаваны з храма 11 ст.), св. Стэфана (1745) у Полацку; бернардынаў у Гродне (званіца сярэдзіны 18 ст.), уніяцкія манастырскія цэрквы ў Оршы (1758) і Беразвеччы (1756—63) і інш.

Бел. скульптура Б., звязаная з царквой, складваецца на мяжы 17—18 ст. («Распяцце» К. Круповіча, 1696; «Трое евангелістаў» з сяла Нягневічы, Марыя і Іаан Багаслоў з групы «Распяцце», прарокі з кампазіцыі «Дрэва Іесеева» — усе сярэдзіны 18 ст.; знаходзяцца ў Дзярж. маст. музеі БССР). Шырока вядома гравюра гэтага перыяду (М. і В. *Вашчанкі*, Ф. *Англейка* і інш.). Барочны кірунак мела і дэкар.-прыкладное мастацтва: славутая *беларуская рэзь* па дрэве і камені, кераміка, вышыўка, ювелірная справа. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Алпатов М. В. Всеобщая история искусств, т. 2, М.—Л., 1949; Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 469—502; Всеобщая история искусств, т. 4, М., 1963; История русского искусства, т. 5, М., 1960; Кудрявцев В. И. Проблема барокко в белорусской архитектуре XVII—XVIII вв., у кн.: Сборник научных работ Ин-та строительства и архитектуры АН БССР. Архитектура и градостроительство, в. 5, Мн., 1961.

А. І. Каплун, Масква; *У. А. Чантурыя*, Мінск.

БАРОМЕТР (грэч. barós цяжар, вага + metreo вымяраю), прылада для вымярэння атмасфернага ціску. Адрозніваюць: вадкасныя Б., заснаваныя на ўраўнаважванні атм. ціску вагою слупка вадкасці; дэфармацыйныя Б., прынцып дзеяння іх заснаваны на пругкіх дэфармацыях мембраннай каробкі (напр., анероід); гіпсатэрмометры, заснаваныя на выкарыстанні залежнасці пункту кіпення некат. вадкасцей ад ціску. Найбольш дакладныя ртутныя Б., яны бываюць чашачныя, сіфонныя і сіфонна-чашачныя. Часцей ужываюцца чашачныя і сіфонна-чашачныя Б. За меру атм. ціску прымаецца ціск ураўнаважанага слупка ртуці, выражаны ў *мм рт. сл.* або ў мілібарах (гл. *Бар*). Дакладнасць адліку ў чашачных Б. — 0,1 мілібар, у сіфонна-чашачных — 0,05 мілібар. Ртутныя Б. з'яўляюцца абсалютнымі прыладамі, бо іх паказанні даюць непасрэдна велічыню атм. ціску. Гл. таксама *Метэаралагічныя прылады*.

Літ.: Гл. пры арт. *Метэаралагічныя прылады*.

БАРОНІН Нічыпар Данілавіч [22.4(5.5).1901, с. Мітрафанава Чэмбарскага пав. Пензенскай губ. — 26.10.1961], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942. Стралковае аддзяленне, якім камандаваў Б., вызначылася 23.6.1944 пры прарыве варожай абароны каля в. Замошша Шумілінскага р-на Віцебскай вобл., пры вызваленні г. п. Шуміліна, фарсіраванні Зах. Дзвіны і ўтрыманні плацдарма на зах. беразе ракі. На ўшанаванне памяці герояў на будынку Мітрафанаўскай СШ, дзе вучыўся Б., устаноўлена мемарыяльная дошка, а на плошчы сяла — абеліск.

БАРОНЬКІ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Зубар. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Баронькі». За 25 *км* на Пд ад Касцюковіч, 185 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Бялынкавічы. 627 ж., двароў 180 (1970). Эл. станцыя, пякарня, сепаратарны пункт, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, сталовая, 2 магазіны. На брацкай магіле абеліск сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАРОЎСКІ Лявон (27.6.1784, маёнтак каля Пінска — 4.4.1846), гісторык літаратуры, перакладчык і публіцыст. З 1814 выкладчык Віленскага ун-та, у 1823—32 праф. рыторыкі і паэтыкі. Першы звярнуў увагу на талент свайго студэнта А. Міцкевіча. Пасля закрыцця ун-та выкладаў у Віленскай каталіцкай духоўнай акадэміі (1833—42). Сярод твораў: «Роздум пра «Манахамахію» Красіцкага» (1818), «Роздум пра паэзію і красамоўства» (1820), «Рыторыка» (1824), «Пра распазнаванне разумовых здольнасцей у моладзі» (1826).

БАРС, ірбіс, снежны барс (Felis uncia), драпежная млекакормячая жывёла з сямейства катоў. Нагадвае леапарда. Даўж. да 130 *см*, хвост каля 90 *см*, маса да 40 *кг*. Доўгая пушыстая поўсць дымчата - шэрага колеру. Па ўсім целе і хвасце раскіданы вялікія кольцападобныя, нясна акрэсленыя цёмна-бурыя або чорныя плямы. Пашыраны Б. у Цэнтр. Азіі. У СССР — у горах Казахстана, Кіргізіі і Таджыкістана, рэдка на Алтаі. Жыве ў зоне альпійскіх лугоў, камяністых россыпаў, зімой сыходзіць ніжэй, у хвойныя лясы. Нараджае 1—3 дзіцянят. Корміцца горнымі баранамі і казамі, суркамі, мышападобнымі грызунамі і птушкамі. Колькасць Б. невялікая.



БАРСАВА (сапр. Уладзіміраўа) Валерыя Уладзіміраўна [1(13).6.1892, Астрахань — 13.12.1967], руская савецкая спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Нар. арт. СССР (1937). Чл. КПСС з 1940. Скончыла Маскоўскую кансерваторыю (1919). Выдатная прадстаўніца рус. вакальнай школы. Вызначылася ў операх М. Глінкі, М. Рымскага-Корсакава. Вядомая камерная спявачка. Дзярж. прэмія СССР 1941.

БАРСЁЕВА, вёска ў Горбаўскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 25 *км* на Пд ад Лёзна, 65 *км* ад Віцебска. 186 ж., двароў 55 (1970). Клуб, б-ка, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі ням. фашысты.

БАРСЕЛОНА (Barcelona), горад на ПнУ Іспаніі, цэнтр гістарычнай правінцыі Каталоніі. Па некат. звестках засн. ў 3 ст. да н. э. Размешчана ўздоўж бухты Міжземнага м. Адзін з найбуйнейшых у краіне портаў, вузел марскіх, чыг. і паветраных шляхоў міжнар. значэння. 1,8 млн. ж. (1968). Першы па развіцці прамысл. горад Іспаніі. 75% тэкст. вытворчасці краіны (некалькі сотняў прадпр., пераважна баваўняных). Сталеліцейная, аўтамабільная, авія-, лакаматыва-, суднабудаўнічая, эл.-тэхн., хім. і паліграф. прамысловасць. Ёсць прадпр. харч., гарбарнай, папяровай прамысл. У эканоміцы моцныя пазіцыі замежнага капіталу. Ун-т (з 1450), музей.

БАРСКАЯ КАНФЕДЭРАЦЫЯ, узброены саюз кансерватыўнай шляхты, клерыкалаў і кіруючых колаў Рэчы Паспалітай для барацьбы супраць уплыву рускага царызму на палітыку каралеўскага ўрада, за захаванне

шляхецкіх вольнасцей і прывілеяў каталіцкай царквы.

Засн. 29.2.1768 у г. Бар на Падоллі па ініцыятыве братоў Адама і Міхала Красінскіх, Ю. Пуласкага і інш. Да Б. к. далучыліся патрыят. колы польскага грамадства, абураныя тым, што рускі пасол М. В. Рапнін арыштаваў працаўнікаў царызму ў Польшчы. Выступленне канфедэратаў прывяло да міжусобнай вайны і сялянскага паўстання супраць шляхецка-каталіцкага прыгнёту ў Правабярэжнай Украіне, т. зв. каліўшчыны, пад кіраўніцтвам М. Залізняка і І. Гонты. Паўстанне задушылі каралеўскія і рус. войскі.

У жн.— кастр. 1768 партыз. барацьба канфедэратараў разгарнулася на Беларусі і ў Літве. Галоўны савет Б. к. пазначыў маршалкам Вял. кн. Літ. Міхала Паца (гл. *Пацы*), а камандуючым арміі (рэгіментажам) Юзафа Сапегу (1769, гл. *Сапегі*). Актыўным дзеячам Б. к. быў буйны магнат Беларусі кн. Кароль Радзівіл (гл. *Радзівілы*). Б. к. намагалі замежныя дзяржавы, якія баяліся ўзмацнення ўплыву Расіі на Польшчу. Турцыя абвясціла вайну Расіі, Аўстрыя дазволіла канфедэратам рыхтаваць на сваёй тэр. атрады, Францыя пасылала ім грошы і ваен. інструктараў. У 1771 рух канфедэратаў на Беларусі ўзмацніўся ў сувязі з далучэннем да іх вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага (гл. *Агінскія*). Супраць Б. к. дзейнічалі войскі, верныя каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму і саюзнай яму царскай Расіі. 12(23).9.1772 войскі М. К. Агінскага былі разбіты А. В. Суворавым пад в. Сталавічы (паблізу Баранавіч), узброеная барацьба пайшла на спад. Дзейнасць Б. к. прывяла да аслаблення Рэчы Паспалітай і садзейнічала яе 1-му падзелу паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй у 1772.

Літ.: Иваницкий С. Ф. Первый период Барской конфедерации, «Ученые записки Ленинградского гос. пед. ин-та», 1941, т. 45; Ягго ж. Польша в половине XVIII в. и возникновение Барской конфедерации, там жа, 1939, т. 22; Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, Мн., 1955, с. 194; Історія Української РСР, т. 1, Київ, 1967, с. 332—334; История Польши, т. 1, 2 изд., М., 1956, с. 376—380; Konopczyński W. Konfederacja Barska, t. 1—2, Warszawa, 1936—38.

П. Р. Казлоўскі. Мінск.

БАРСТОК Марыя Мікітаўна [н. 2(15).4.1916, в. Наркавічы Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1950). З сялян. Скончыла Полацкі пед. тэхнікум (1935), філал. ф-т БДУ (1945). У 1935—37 настаўнічала. З 1950 ст. навук. супрацоўнік Ін-та л-ры АН БССР. Друкуецца з 1949. Аўтар кніг і брашур пра творчасць бел. пісьменнікаў, артыкулаў, прысвечаных бел. дзіцячай л-ры, сааўтар «Нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры» (1956), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1—2, 1964—66).

Тв.: Вобраз старэйшага героя ў творчасці Якуба Коласа, Мн., 1951; Пятро Глебка, Мн., 1952; Пятрусь Броўка, Мн., 1955; Віднейшы беларускі дзіцячы пісьменнік Янка Маўр, Мн., 1958; Вывучэнне творчасці Кузьмы Чорнага ў школе, Мн., 1959; Максім Багдановіч, Мн., 1961; Максім Танк, Мн., 1962.

БАРСУК (Meles meles), драпежная млекакормячая жывёла з сямейства куніцавых. Даўж. да 90 *см*, хвост да 20 *см*, маса каля 30 *кг*. Тулава прысадзістае, рэзка звужанае да галавы. Ногі кароткія з моцнымі кіпцюрамі. Поўсць грубая, даўгаватая на спіне і баках, шараватая або буравата-шэрая. Морда белая. Удоўж галавы, цераз вочы, праходзяць 2 чорныя палосы. Водзіцца Б. у лясах Еўропы і Азіі, акрамя краін на Пд ад Гімалаяў.



Трапляецца па ўсёй Беларусі. Спосаб жыцця начны. Корміцца беспазваночнымі, жабамі, грыбамі, жалудамі. Нараджае да 6 дзіцянят. Жыве ў норах, якія сам рые. У паўн. частцы арэалу Б. зімой спіць, у паўд.— актыўны ўвесь год. Прамысл. жывёла, але каштоўнасць яе невялікая.

БАРСУКІ, беларускія ткачы слуцкай мануфактуры канца 18 — 1-й пал. 19 ст. 1) Іосіф (г. н. і см. невяд.), майстар-ткач *слуцкіх паясоў*. З мяшчан. У 50-я г. 18 ст. вучыўся майстэрству стварацъ залататканыя паясы ў Я. Мажарскага. 2) Фама (г. н. і см. невяд.), кіраўнік слуцкай мануфактуры (1807—44). З мяшчан. У мінулым пісар. У перыяд яго кіраўніцтва мануфактура зменшыла выпуск слуцкіх паясоў, іх заменьвалі ўзорыстыя і залататканыя тканіны. *М. С. Кацар.* Мінск.

БАРСУКІ, вёска ў Порплішчанскім с/с Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Камсамолец». За 5 *км* на ПнЗ ад Докшыц, 195 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. раз'езда Порплішча. 332 ж., двароў 113 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка.

БАРСУКІ, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Валадарскага. За 6 *км* на З ад Кармы, 116 *км* ад Гомеля, 54 *км* ад чыг. ст. Рагачоў, 9 *км* ад прыстані Карма на р. Сож, 19 *км* ад вузла аўтамаб. дарог у в. Доўск. 357 ж., двароў 113 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, мед. пункт, аддз. сувязі, магазін, швейная майстэрня. Помнік сав. воінам, якія загінулі пры вызваленні Б. у ліст. 1943.

БАРСУКІ, вёска ў Паўлавіцкім с/с Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Куйбышава. За 12 *км* на Пд ад г. п. Кіраўск, 103 *км* ад Магілёва, 31 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна. 251 ж., двароў 72 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БАРСУКІ, вёска ў Домжарыцкім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Чкалава. За 24 *км* на ПдЗ ад Лепеля, 139 *км* ад Віцебска. 162 ж., двароў 54 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт.

БАРСУКІ, вёска ў Жодзінскім с/с Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр эксперымент. базы «Жодзіна» Бел. НДІ земляробства. За 18 *км* на ПнУ ад Смалявіч, 56 *км* ад Мінска, 5 *км* ад чыг. ст. Жодзіна, на шашы Мінск — Масква. 466 ж., двароў 139 (1970). Пач. школа, дзіцячыя яслі.

БАРСУКОЎ Міхаіл Захаравіч (н. 6.8.1919, в. Лушна Полацкага пав. Віцебскай губ.), беларускі савецкі архітэктар. У 1941—44 удзельнік партыз. руху. У 1948 скончыў Бел. політэхн. ін-т. Працуе ў Мінскпраекце. Работы ў Мінску: упраўленне Бел. чыгункі (1948—52, з В. Гусевым); ін-ты — гісторыі партыі пры ЦК КПБ (1952—55), Аргтэхбуда (1967), удасканалення ўрачоў (1967—68); Дом інвалідаў (1958—60); гасцініца «Спадарожнік» (1960—62); СКБ тэкст. і лёгкай прамысл. (1966—68). Аўтар планіроўкі новай плошчы па вул. Чкалава (1962), праекта рэканструкцыі клінічнага гарадка (1964). Праектуе 9-павярховыя тыпавыя буйнапанельныя і каркасна-панельныя жылыя дамы (1966—67), інтэр'еры, мемарыяльныя помнікі.

БАРСУКОЎ Міхаіл Іванавіч [н. 11(23).1.1890, Масква], савецкі дзеяч аховы здароўя, дзяржаўны дзеяч БССР. Праф. (1952). Чл. КПСС з 1917. Скончыў мед. ф-т Маскоўскага ун-та (1914). У час Кастр. рэвалюцыі кіраваў мед.-сан. аддзелам Ваенна-рэвалюц. камітэта Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэп. Узначальваў перабудову ваенна-сан. службы і Чырв. Крыжа. У 1924—30 нарком аховы здароўя БССР. У Айч. вайну нач. эвакапунктаў Калінінскага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў; з 1945 заг. аддзела гісторыі сав. аховы здароўя Ін-та сацыяльнай гігіены і аховы здароўя імя Сямашкі. Аўтар прац па гісторыі і тэорыі сав. аховы здароўя. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, а таксама медалямі.

Тв.: Великая Октябрьская социалистическая революция и организация советского здравоохранения, М., 1951.

Літ.: Крючок Г. Р. Видный деятель советского здравоохранения, «Здравоохранение Белоруссии», 1960, № 2.

БАРСУКОЎ Якаў Нікандравіч [н. 23.10 (5.11).1904, в. Кульшыцы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Гомельскую сав.-парт. школу (1931). З 1932 на сав.-гасп. рабоце, з 1938 інструктар, потым сакратар Добрушскага РК КП(б)Б. У жн. 1941 накіраваны ў тыл ворага для арганізацыі падпольнай работы ў Добрушскім р-не. Стварыў партыз. атрад і быў яго камісарам. У кастр. 1941 выйшаў у сав. тыл. Са студз. 1942 кіраўнік дыверсійнай групы ў Віцебскай вобл. З мая 1942 камісар, з сак. 1943 камандзір *партызанскай брыгады 2-й Беларускай* імя П. К. Панамарэнкі Віцебскай вобл. і сакратар Мехаўскага падпольнага РК КП(б)Б. З кастр. 1943 першы сакратар Добрушскага РК КП(б)Б. Са студз. 1944 на парт. рабоце ў Гомельскай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Гродне.

БАРТАК (Bartók) Бела (25.3.1881, с. Надзсентміклаш, Трансільванія — 26.9.1945), венгерскі кампазітар, піяніст, фалькларыст і педагог. З 1907 праф. Муз. акадэміі ў Будапешце. Праследаваўся фашыстамі, у 1940 выехаў у ЗША. З З. Кодаем многа гадоў збіраў і вывучаў венг. сялянскую песню, а таксама рум., славацкі, серб., харв., зах.-ўкр. фальклор; аўтар навук. прац. На аснове фальклору склаўся самабытны дынамічны муз. стыль Б., які вызначаецца інтанацыйнай свежасцю, павелічэннем ролі рытмікі, багаццем поліфанічнай фактуры, выразнасцю і нечаканасцю гарманічных спалучэнняў. Лепшыя творы Б. паставілі яго ў шэраг найб. значных кампазітараў 20 ст. Сярод твораў: опера «Замак герцага Сіняя Барада» (1911), балеты «Драўляны прынц» (1916) і «Цудоўны мандарын» (1919), музыка для струнных, ударных і чэлесты (1936), Дывертысмент для струннага аркестра (1939), Канцэрт для аркестра (1943), 3 фп. і 2 скрыпічныя канцэрты, шэсць струнных квартэтаў, напісаны з пед. мэтай фп. цыкл «Мікракосмас». Міжнар. прэмія Міру 1955.



Літ.: Мартынов И. И. Бела Барток, М., 1968; Нестьев И. В. Бела Барток, М., 1969.

БАРТАЛАМЕЁЎКА, вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Беседзь (2 *км*). Цэнтр Беседскага с/с і саўгаса «Высакаборскі». За 16 *км* на ПнУ ад Веткі, 38 *км* ад Гомеля, 32 *км* ад чыг. ст. Добруш. 814 ж., двароў 228 (1970). Торфабрыкетны з-д. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік-манумент на брацкай магіле 57 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАРТАЛЬД Васіль Уладзіміравіч [3(15).11.1869, Масква — 19.8.1930], савецкі ўсходазнавец, акад. (з 1913). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1891). Упершыню ў сусв. практыцы распрацаваў гісторыю Сярэд. Азіі па першакрыніцах. Вывучаў гісторыю ісламу араб. халіфата, Ірана, Каўказа, Закаўказзя, цюрк. і манг. народаў. Значную ўвагу аддаваў пытанням рус. і сусв. ўсходазнаўства. Перабольшваў ролю культ. ўплыву на развіццё народаў.

Тв.: Соч. [у 9-ці т.], т. 1—6, М., 1963—68.

БАРТАШОЎ Макар Уласавіч [7(20).9.1909, г. Жлобін — 7.2.1948], Герой Савецкага Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1931. З 1929 у Чырв. Арміі. Вызначыўся ў час вайны з Японіяй (1945). 9—17.8.1945 дывізія марской авіяцыі, якою камандаваў Б., наносіла трапныя масіраваныя ўдары па часцях Квантунскай арміі ў портах Юкі, Расін, Сейсін, на чыг. ст. Фуней і Тумынь. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў. Пахаваны ў Калінінградзе.



БАРТАШЫ, вёска ў Скоржыцкім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калга-

са «Радзіма». За 5 *км* на З ад Шчучына, 58 *км* ад Гродна, 8 *км* ад чыг. ст. Ражанка, каля шашы Гродна — Ліда (1,5 *км*). 232 ж., двароў 67 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, магазін. Помнік і мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 14 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БАРТКЕВІЧ Вінцэнты (1776, маёнтак Палессе Завілейскага пав. Віленскага ваяводства — г. см. невяд.), удзельнік паўстанняў 1794 і 1831 у Літве і на Беларусі. У 1794 абараняў Варшаву, трапіў у палон. Напярэдадні паўстання 1831 завілейскі павятовы віцэ-маршалак. У крас. 1831 камандуючы паўстанцкіх узбр. сіл Завілейскага пав., на чале іх удзельнічаў у баях за Вільню. Пасля паражэння адступіў у Дзісенскі пав. і злучыўся з дзісенскімі паўстанцамі. Адзін з гал. камандзіраў у час паходу аб'яднаных паўстанцкіх сіл З паветаў у Жамайцію для злучэння з мясцовымі атрадамі. У студз. 1832 арыштаваны і сасланы ў Волагду. Пасля ссылкі жыў у Смаленскай губ., там і памёр.

Літ.: Bielński K. Rok 1831 w powiecie Zawilejskim (Święciańskim), Wilno — Święciany, 1930.
Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

БАРТНОЎСКІ Дамітрый Піліпавіч [н. 19.10 (1.11).1902, в. Старыя Церашковічы Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], савецкі ваенны дзеяч. Ген.-л. авіяцыі (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1939. У Ваен.-Марскім Флоце з 1922. Скончыў Гомельскі тэхнікум шляхоў зносін (1922), Севастопальскую школу марскіх лётчыкаў (1926), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1951). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну нач. штаба ВПС Ваен.-Марскога Флоту. Удзельнічаў у арганізацыі абароны Севастопаля, Ленінграда, Запаляр'я, у выкаланні Севастопаля і Прыбалтыкі. З 1945 нач. штаба і 1 намеснік нач. ВПС Флоту, з 1952 нач. Вышэйшых афіцэрскіх курсаў у 1954—60 у Ульянаўску. Дэпутат Мінскага абласнога Савета 2 склікання. Узнагароджаны 8 ордэнамі і медалямі. Жыве ў Маскве.



БАРТНЯНСКІ Данілай Сямёнавіч [1751, Гродна — 28.8(9.9).1809, Пецярбург], рускі і ўкраінскі кампазітар. Вучыўся ў Пецярбургскай школе хору пры Імператарскай капэле. У 1769—79 вучыўся ў Італіі, дзе быў прызнаны лепшым оперным кампазітарам. З 1796 працаваў у Пецярбургскай імператарскай капэле, з 1801 кіраваў ёю. Пісаў оперы, харавыя і інструм. творы. Аўтар класічнага ўзору рус. нац. харавой музыкі (дасканалае валоданне прыёмамі харавой музыкі і багацце канцэрта). Вялікія інстр. творы Б. — канцэртная сімфонія, квінтэт, квартэт, сімф. і скрыпічныя санаты — мелі ўплыў на развіццё гэтых жанраў. Зрабіў рэформу ў опернай музыцы, якая ў яго творах набыла рэальную аснову, стала больш дынамічнай, выразнай. Аўтар 35 опер, з якіх найбольш вядомыя «Сокал» (1786) і «Сын-сапернік, ці Новая Стратоніка» (1787).

Літ.: Доброхотов Б., Д. С. Бортнянский, М.—Л., 1950.

БАРТУ (Barthou) Жан Луі (25.8.1862—9.10.1934), французскі дзяржаўны дзеяч. Шмат разоў быў міністрам. У сак.—снеж. 1913 прэм'ер-міністр. Выступаў за ўмацаванне Антанты, павялічыў тэрмін вайсковай службы да 3 гадоў. Узначальваў франц. дэлегацыю на *Генуэзскай канферэнцыі 1922*. Вёў палітыку ізаляцыі Сав. дзяржавы. Міністр юстыцыі (1926—29), замежных спраў (люты — кастр. 1934). Каб умацаваць бяспеку Францыі пасля ўстанаўлення ў Германіі фаш. дыктатуры, дамагаўся збліжэння з СССР. У 1934 паведаў Сав. Саюз, садзейнічаў заключэнню савецка-франц. дагавору 1935, ініцыятар запрашэння СССР у Лігу Нацый. Забіты разам з югасл. каралём Аляксандрам I фаш. наймітам у Марселі.

БАРТ-ЦІШЫНСКІ (Bart-Cišinski) Якуб (20.8.1856, в. Кукаў, Саксонія — 16.10.1909), сербска-лужыцкі паэт, прадстаўнік нац.-культ. руху лужыцкіх сербаў. З сялян. Літ. славу Б.-Ц. прынесла «Кніга санетаў» (1884). Аўтар зб. «Формы» (1888), «Сербскія гукі» (1897), «Кроў і край» (1900), «Святло з вышыні» (1911). Пераклаў вершы А. Міцкевіча, М. Лермантава, чэшскіх паэтаў. У ГДР установлена літ. прэмія імя Б.-Ц. На бел. мову яго творы пераклалі М. Танк, А. Зарыцкі, Р. Барадулін.

Тв.: Бел. пер. у час. — «Полымя», 1965. № 6; «Беларусь» 1969. № 6; у кн.: Там, дзе Шырава ціміянь. Мн., 1969.

БАРТЭЛЬС Артур (1818, Вільня — 23.12.1895), паэт-песеннік, карыкатурыст, ілюстратар. Спец. маст. адукацыі не меў. Вучыўся ў Пецярбургу, Парыжы. Удзельнічаў у шэ-



А. Бартэльс. Аўтапартрэт. 1844.

сцідзесятых гадах 19 ст. ў выданні «Пчала», выдаваў «Пантэон карыкатур». Выдаваў і ілюстраваў «Пчалу», «Пантэон карыкатур», «Пантэон смеху», «Пантэон сатыры», «Пантэон гумару», «Пантэон жартаў», «Пантэон дасціпнасці», «Пантэон вясёлага чалавека», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў», «Пантэон вясёлага чалавека і яго сям'і і сяброў і знаёмых і незнаёмых і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеляў і ворагаў і прыяцеля

белыя або зялёнажоўтыя. Цыкл развіцця пераважна монакарпічны (пладаносіць раз у жыцці). Вядома 70 відаў, пашыраных у краінах Паўн. паўшар'я; у СССР 39, у БССР адзін — Б. сібірскі (H. sibiricum, нар. назвы: баршчаўка, бядрыца, баршч, вярлома); у Цэнтр. бат. садзе АН БССР вывучаецца каля 20 відаў Б. Расце на лугах, агародах, каля дарог, па берагах рэк. Некат. віды гадуюць як дэкаратыўныя. Зялёная маса багатая на вугляводы, вітамін С, бялок, эфірны алей, мае высокія кармавыя якасці і добра сіласуецца. Сцяблы і лісце некат. відаў ядомыя. Ужываецца ў нар. медыцыне. Эфірны алей з пладоў выкарыстоўваюць у парфумерыі.



Баршчаўнік сібірскі.

БАРШЧЭЎСКІ Ян (1794, па інш. крыніцах 1790, в. Марогі каля воз. Нешчарда Віцебскай губ.— 11.3.1851), беларускі і польскі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Вучыўся ў Полацкай езуіцкай калегіі, дзе ў 1809 напісаў першы твор на польскай мове — псеўдакласічную паэму «Пояс Венеры». Падарожнічаў па Беларусі, збіраў бел. фальклор, апісваў курганы і гарадзішчы. У 20-я г. пераехаў у Пецярбург. Там пазнаёміўся з А. Міцкевічам і Т. Шаўчэнкам, арганізаваў літ. гурток, які аб'яднаўваў выхадцаў з Беларусі, выдаваў польскі альманах «Незабудка» (1840—44). З бел. твораў Б. вядомыя 3 вершы: прысвечаны падзеям 1812 «Рабункі мужыкоў» (урыўкі), дыдактычныя «Дзеванька» і «Гараліца». На польскай мове выдаў зб. «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (т. 1—4, 1844—46, Пецярбург), у якім шырока выкарыстаў бел. легенды і казкі. У перакладзе на бел. мову легенды з гэтага зб. надрукавала віленская газ. «Гоман» (1916). Як паэт склаўся пад уплывам польскага класіцызму. Захапляўся рамант. паэзіяй А. Міцкевіча, што адбілася на яго польскіх творах (паэма «Жыццё сіраты», санеты «Мелодыі пілігрыма»).



Тв.: Szkic północnej Białorusi, «Rocznik literacki», 1843; Proza i wiersze, cz. 1, Kijów, 1849; бел. пер. — Начэрнасць, Вільня, 1917; Чарнакніжнік і змяя, што вылупілася з птушынага яйца, Вільня, 1917.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969, с. 37—42; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе, Мн., 1969; Зямкевіч Р. Ян Баршчэўскі, першы беларускі пісьменнік XIX стагоддзя, Вільня, 1911; Васілеўскі Д. М. Новыя матэрыялы творчасці Яна Баршчэўскага, «Полымя», 1925, № 5; Яго ж. Пад аховай роднай песні (з перапіскі Яна Баршчэўскага), «Маладняк», 1928, № 1; Бас І. Каму належаць вершы?, «Беларусь», 1963, № 11.

А. І. Мальдзіс. Мінск.

БАРЫЕНЫ (ад грэч. barýs цяжкі), элементарныя часцінкі з паўцэлым спінам, якія моцна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Адносяцца да *адронаў*. Раней Б. называлі элементарныя часцінкі з самымі вялікімі масамі спакою. Змест тэрміна змяніўся пасля адкрыцця ў 1960 вял. колькасці нестабільных рэзанансаў, сярод якіх пачалі вылучаць Б. і *мезоны*. Як і ўсе часцінкі паўцэлага *спіна*, Б. з'яўляюцца ферміёнамі.

Адносна часу жыцця Б. падзяляюцца на дзве групы. Першую ўтвараюць т. зв. стабільныя Б.: нейтрон (n), пратон (p), лямбда-, сігма- і ксігіперон (Λ^0, $\Sigma^{\pm}_0$, Ξ^-), амега-часцінка (Ω^-) і іх антычасцінкі. Яны маюць сярэдні час жыцця ад 10^3 *сек* (n) да велічыні меншай за 10^{-14} *сек* (Σ^0). Акрамя пратона, які існуе практычна бясконца. Другую групу складаюць вельмі нестабільныя барыённыя рэзанансы з часам жыцця ад 10^{-22} да 10^{-24} *сек*. Рэакцыі з удзелам Б. рэгулююцца *захавання законамі*. Пад уплывам розных узаемадзеянняў Б. распадаюцца, але ў канчатковых прадуктах распаду, акрамя лёгкіх часцінак (лептонаў), абавязкова прысутнічае абсалютна стабільны пратон. Таму ядры атамаў цалкам не ператвараюцца ў лептоны, мезоны ці фатоны, што абумоўлівае стабільнасць нашага свету. Гэты факт адлюстроўвае паняцце закону захавання ліку Б., т. зв. барыённага зараду.

Літ.: Богуш А. А. и Морозов Л. Г. Элементарные частицы, Мн., 1966; Берестецкий В. Б. Динамические симметрии сильно взаимодействующих частиц, «Успехи физических наук», 1965, т. 85, в. 3.

І. С. Саўчанкавіч. Мінск.

БАРЫЙ (Barium), Ba, хімічны элемент II групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, з падгрупы шчолачназямельных металаў. Атамны нумар 56, ат. м. 137,34. Свабодны Б. атрыманы ў 1808 англ. вучоным Х. Дэві (1778—1829). У зямной кары яго 0,05% па масе, трапляецца толькі ў злучэннях (барыт $BaSO_4$, вітэрыт $BaCO_3$).

Прыродны Б. складаецца з 7 устойлівых ізатопаў, сярод іх пераважае ^{138}Ba (71,66%). Б.— мяккі, бліскучы метал белага колеру, шчыльн. 3500 *кг/м*³, *t* пл. 710 °С, *t* кіп. 1640 °С, рашотка аб'ёмнацэнтраваная кубічная. Хімічна вельмі актыўны: з кіслародам утварае воксіды BaO і пераксід BaO_2, з азотам нітрыд Ba_3N_2, з вадародам гідрыд BaH_2, з вугляродам — карбід BaC_2, з вадой — моцную аснову $Ba(OH)_2$. Солі Б., што растваральныя ў вадзе, атрутныя. Атрымліваюць Б. награваннем у вакууме BaO з парашком алюмінію ці электролізам расплаўленай сумесі $BaCl_2$ з KCl, захоўваюць пад слоем газы. Злучэнні Б. ўжываюцца ў рэнтгенаўскіх установах і ядз. рэактарах як ахоўн. матэрыялы, у піратэхніцы, тэхніцы высокага вакууму.

Літ.: Некрасов Б. В. Основы общей химии, т. 1—3, М., 1965—70.

БАРЫКІН Емяльян Ігнатавіч (жн. 1902, в. Троспа Кромскага пав. Арлоўскай губ.— 25.3.1951), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1928. З 1915 рабочы паравознага дэпо ст. Бранск. З 1937 на парт. рабоце. У 1941 сакратар Гомельскага гаркома КП(б)Б. Узначальваў арганізацыю абароны Гомеля ад пям.-фаш. захопнікаў. У тыле ворага ствараў парт. падполле і кіраваў партыз. рухам. Чл. Гомельскага падпольнага абкома, сакратар Гомельскага падпольнага гаркома КП(б)Б, адзін з арганізатараў партыз. атрада «Бальшавік», які ўзнік у жн. 1941. З ліст. 1942 нач. штаба *Гомельскага партызанскага злучэння*. У 1944—48 сакратар Гомельскага гаркома, з 1948 сакратар Баранавіцкага абкома КП(б)Б. Дэп. Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Імем Б. названы вуліца і школа ў Гомелі, цеплаход.



Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы, т. 1, Мн., 1967; Калинин П. Партизанская республика, 2 изд., Мн., 1968.

А. В. Сямёнава. Мінск.

БАРБІРАВАННЕ, хіміка-тэрмічны спосаб насычэння борам паверхні стальных вырабаў. Робіцца, каб павялічыць іх зносаўстойлівасць, супраціўленне карозіі. Існуе электролізнае, газавае, вадкаснае і цвёрдае Б. Пашырана электролізнае Б. ў расплаўленым бураксе. Т-ра працэсу 900—950° С, шчыльн. току 0,2 *а/см*², вытрымліваюць 4—6 *гадз*. Структура слоя — барыды жалеза (FeB, Fe_2B), таўшчыня 0,2—0,3 *мм*.

БАРЫС ГАДУНОЎ (Барыс Фёдаравіч Гадуноў; каля 1552—13.4.1605), рускі цар [1598—1605], фактычна правіў дзяржавай з 1584. З роду знатных баяр Гадуновых. Жанаты з дачкой кіраўніка апрычнікаў Малюты Скуратава-Бельскага. Быў у сваяцкіх сувязях з царскай сям'ёй (сын Івана IV — цар Фёдар Іванавіч — жанаты з сястрой Б. Г.— Ірынай), адцясніў ад дзярж. дзейнасці прадстаўнікоў знатнага баярства — Мсціслаўскіх, Шуйскіх, Раманавых і стаў кіраваць дзяржавай пры хваравітым цару *Фёдару Іванавічу*. Пасля смерці бяздзетнага Фёдара Земскі сабор выбраў Барыса царом (1.9.1598). Апіраючыся пераважна на служылае дваранства, працягваў палітыку Івана IV па цэнтралізацыі дзяржавы і ўмацаванні царскай улады. За гады яго праўлення ўмацаваліся пазіцыі Расіі на міжнар. арэне. У выніку вайны са Швецыяй (1590—93) вернуты землі, страчаныя ў *Лівонскую вайну 1558—83* — Івангарад, Ям, Арэшак, Капор'е і Карэла. Перамір'е з Рэччу Паспалітай было прадоўжана. Пры ім узмацнілася прыгонная залежнасць сялян і халопаў. Каб замацаваць сялян за памешчыкамі, у 1581—92 быў праведзены перапіс аямель і насельніцтва; указам 1597 вызначаны 5-гадовы тэрмін пошуку абеглых сялян, а «вольныя халопы» ператвараліся ў кабальных. Гэта выклікала сялянскія паўстанні. Незадаволеныя нар. масы падтрымалі *Ілжэдамітрыя I*, які ў 1604 пачаў вайну супраць Б. Г. У час наступлення Ілжэдамітрыя I Б. Г. раптоўна памёр, у чэрв. 1605 самазванец заняў Маскву. Сын Б. Г., цар Фёдар, быў забіты.

Літ.: Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 4 (т. 7—8), М., 1963; Ключевский В. О. Соч., т. 3, ч. 3, М., 1957; Платонов С. Ф. Борис Годунов, П., 1921.

С. Д. Вайтовіч. Мінск.

БАРЫС УСЯСЛАВІЧ (г. н. невяд.— п. 1128), князь полацкі, сын *Усяслава Брачыславіча*. Жанаты з дачкою вял. кн. кіеўскага Мсціслава Уладзіміравіча. Паводле В. М. Таціщава, у 1102 зрабіў паход на ятвягаў і, вярнуўшыся, заснаваў г. Барысаў. На гэтай падставе лічаць, што полацкім кн. стаў у 1101 (пасля смерці Усяслава). Пры ім былі рэзка абмежаваны правы князя ў Полацку, узмацнілася гарадское самакіраванне. З імем Б. У. звязваюць надпісы на *Барысавых камянях* і буд-ва цэркваў Барысаглебскага манастыра ў *Бельчыцах*.

Літ.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля (Очерки истории Северной Белоруссии) в IX—XIII вв., М., 1966.


БАРБІСАВА-ЛЕПЕЛЬСКАЯ КУЛЬТУРА, гл. *Шнуравой керамікі культура*.

БАРЫСАВІЧЫ, вёска ў Лабжанскім с/с Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Герой працы». За 17 *км* на З ад Клімавіч, 140 *км* ад Магілёва, 15 *км* ад чыг. ст. Крычаў. 469 ж., двароў 180 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч-ак. пункт, магазін. Абеліск 169 воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БАРЫСАВЫ, дзекабрысты, браты; Андрэй Іванавіч (1789—30.9.1854), адстаўны падпаручнік; Пётр Іванавіч (1800—30.9.1854), падпаручнік 8-й артыл. брыгады. З безмаянткових дваран. На ваен. службе з 1816. Заснавальнікі «Т-ва першай згоды» (1818), якое па ініцыятыве Пятра Б. ператворана ў тайнае паліт. «Т-ва сяброў прыроды», а ў 1823 пры ўдзеле чл. Саюза вольных палякаў Ю. Люблінскага — у «Т-ва з'яднаных славян». З 1825 старшынёй яго быў Пётр Б. У 1825 т-ва аб'ядналася з Паўднёвым т-вам дзекабрыстаў. Б. ўваходзілі ў групу, якой даручалася забіць цара Аляксандра I. Пасля задушэння паўстання Чарнігаўскага палка (29.12.1825—3.1.1826) члены Паўднёвага т-ва дзекабрыстаў спрабавалі ўзняць паўстанне ў Палтаўскім палку, раскватараваным у Бабруйску. Пётр Б. меркаваў зрабіць Бабруйск цэнтрам паўстання, умацавацца з палком Тызенгаўзена ў крэпасці і, калі ўдасца, узняць на паўстанне 2-ю армію, 4-ы і 5-ы карпусы, ісці на Маскву. Арыштаваны і засуджаны на вечную катаргу, пазней — на 13 гадоў. З 1839 на пасяленні ў Іркуцкай губ. Пасля раптоўнай смерці Пятра Андрэй скончыў жыццё самагубствам.

Ю. І. Афонін. Мінск.

БАРЫСАВЫ КАМЯНІ, манументальныя помнікі эпіграфікі 12 ст. на тэр. Беларусі. 4 вялікія валуны з высечанымі на іх шасціканцовымі крыжамі і надпісамі «Господи помози рабу своему Борису» знаходзіліся ў рэчышчы Зах. Дзвіны. Да прыняцця хрысціянства гэтыя камяні з'яўляліся язычніцкімі фетышамі. Крыжы на іх выбіты паводле



Барысаў камень каля в. Накоўнікі Верхнядзвінскага раёна.

загаду полацкага князя *Барыса Усяслававіча* ў 1-й трэці 12 ст. ў сувязі з ажыўленнем язычніцкіх вераванняў і каб увекавечыць імя князя. Да нашага часу ў рэчышчы абярогся толькі адзін з іх — каля в. Падкасцельцы за 5 *км* ад Полацка. Насельніцтва называе яго Барыс-хлебнік. Бытуе легенда, быццам на камені ляжыць бохан хлеба. Камяні з падобнымі надпісамі захаваліся каля в. Каменкі недалёка ад г. Вілейкі і в. Высокі Гарадзец Талачынскага р-на. У рэчышчах Зах. Дзвіны вядомыя таксама 2 камяні з надпісамі «Сулиборь хрьст» і «Святополк-Александр». Каля Оршы быў т. зв. Рагвалодаў камень.

Літ.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966; Тарановичъ В. П. К вопросу о древних лапидарных памятниках с историческими надписями на территории Белорусской ССР, «Советская археология», 1946, т. 8. *Г. В. Штыхаў.* Мінск.

БАРЫСАГЛЕБСКАЯ ЦАРКВА ў Гродне (Барысаглебская царква на Каложы, Каложская царква), выдатны помнік старажытнарускай архітэктуры. Пабудавана майстрамі гродзенскай арх. школы ў 2-й пал. 12 ст. на высокім правым беразе Нёмана. Збераглася часткова. Адносіцца да шасцістаўповых, трохапсідных, крыжовакупальных храмаў. Мае адносна тонкія сцены (муроўка плінфай — плоскай цэглай) і круглыя стаўпы (4 усходнія ўтваралі падкупальны квадрат, 2 заходнія апіраліся на хоры). Нясучыя канструкцыі Б. ц. паменшанага сячэння. У скляпенні і верхнія часткі сцен уманціраваны керамічныя збаны-галаснікі. Фасад храма ўпрыгожаны расчлянёнымі вертыкальнымі цягамі-лапаткамі ступеньчатага профілю, устаўкамі з неапрацаваных і плоскіх паліраваных валуноў, жоўтымі, ялёнымі і карычневымі маёлікавымі плітками 16 тыпаў. Стараж. фрэскі, адкрытыя пад слоем тынку ў 70-я г. 19 ст. ў час буд. работ у царкве, да нашых дзён не захаваліся. Б. ц. з комплексам помнікаў на Замкавай гары ўваходзіць у гродзенскі гісторыка-археал. запаведнік.

Літ.: История русского искусства, т. 1, М., 1953, с. 306—307; Воронин Н. Н. Древнее Гродно, у кн.: Материалы и исследования по археологии древнерусских городов, т. 3, М., 1954 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 41); Кудряшев В. И. Гродно, М., 1960, с. 16—21; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969, с. 22—25; Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży w Grodnie, Grodno, 1936. *У. А. Чантурыя.* Мінск.

БАРЫСАЎ, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Чыг. ст., прыстань на р. Бярэзіна, за 71 *км* на ПнУ ад Мінска. 84,0 тыс. ж. (1970). Другі па колькасці нас. і прамысловым значэнні горад у вобл. Паводле звестак В. М. Татіщава, Б. пабудаваны полацкім кн. *Барысам Усяслававічам* пасля паходу на ятвягаў у 1102. Упершыню ўпамінаецца ў Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 1127 (у Іпацьеўскім пад 1128) як умацаваны горад Полацкага княства, заняты кіеўскім кн. Мсціславам Уладзіміравічам. Археал. даследаванні паказалі, што Б. заснаваны на месцы в. Стары Барысаў, дзе да нашага часу захавалася гарадзішча, а пазней перанесены ў сутоку р. Схі і Бярэзіны — на месца сучаснага Б. Каля в. Стары Барысаў выяўлены таксама курганы могільнік 12 ст. З канца 13 ст. Б. у складзе Вял. кн. Літоўскага. У 1431 горад разбураны ў выніку міжусобнай барацьбы князёў Ягайлы, Свідрыгайлы і Жыгімонта. З 1542 уваходзіў у Віленскую дзяльніцу (ваяводства), з 1563 цэнтр Барысаўскага староства. У 1563 ад караля Жыгімонта II Аўгуста атрымаў гарадское права, якое пацвярджалася ў 1577, 1595, 1640 і 1792. У 1792 зацверджаны герб горада — на сярэбраным полі вароты з дзвюма вежамі. Пасля Люблінскай уніі 1569 Б. — староства лепшага ўладання князёў Агінскіх, потым Радзівілаў; уваходзіў у Аршанскі павет Мінскага ваяводства. У руска-польскую вайну 1654—67 узяты рус. войскамі (1655). У 1662 заняты палякамі. У Паўночную вайну 1700—21 Б. займалі то рус., то шведскія войскі. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) з цэнтр. часткай Беларусі ўвайшоў у склад Рас. дзяржавы; павятовы горад Мінскага намесніцтва, з 1795 Мінскай губ. У Айчынную вайну 1812 заняты корпусам маршала Даву, у горадзе быў створаны харчовы пункт франц. арміі. 14—17(26—29).11.1812 пад Б. рус. армія разбіла армію Напалеона пры пераправе цераз Бярэзіну; горад быў разбураны і спалены. У 1825 у Б. было 2188 ж., 319 дамоў, 1 навуч. ўстанова, 2 царквы. Пасля буд-ва чыгункі Масква — Брэст (1871) непадалёк ад горада выраслі станцыя і гандлёва-прамысл. пасёлак Нова-Барысаў, які ў 1900 зліліся з Б. Паводле перапісу 1897 у Б. было 15 063 ж., з іх 41,7% пісьменных. У 1902 тут дзейнічала іскраўская арг-цыя, у снеж. 1904 узнікла *Барысаўская арганізацыя РСДРП(б)*. У 1904 на прадпр. Б. працавалі 1534 рабочыя. Сав. ўлада ўстаноўлена 5(18).11.1917. У лют. 1918 захоплены войскамі кайзераўскай Германіі. Барацьбу з акупантамі ўзначаліў Барысаўскі падраённы к-т РСДРП(б). У снеж. 1918 вызвалены Чырв. Арміяй. У жн. 1919 акупаваны бурж. Польшчай. У выніку *Бярэзінскіх аперацый 1920* Чырв. Армія вызваліла Б. Паводле перапісу 1939 у Б. 49 тыс. ж. У Вялікую Айчынную вайну 2.7.1941 захоплены ням.-фаш. войскамі. У горадзе дзейнічала *Барысаўскае камуністычнае падполле*. За гады акупацыі амаль поўнасцю разбураны і спалены; гітлераўцы загубілі 24 194 сав. грамадзян, прычынілі страты гораду больш як на 100 млн. руб. У выніку *Беларускай аперацыі 1944* вызвалены Сав. Арміяй 1 ліп. 13 вайсковым злучэнням і часцям, якія вызвалялі горад, прысвоена ганаровае найменне «Барысаўскіх».

За гады Сав. улады ператварыўся ў значны прамысл. і культурны цэнтр рэспублікі. У 1969 у Б. было 36 вялікіх прадпрыемстваў. Аб'ём валавой прадукцыі прамысл. ў 1969 у параўнанні з 1913 вырас у 100 разоў. Асабліва хутка развіваюцца машынабудаванне і металаапрацоўка. З-ды: гідраапаратуры, аўтатрактарнага электраабсталявання, рамонтна-механічны, «Пралетарскі молат», «Чырвоны металіст» (вытв. эмаліраванага посуду), аўтарамонтны. Гал. роля ў прамысл. Б. належыць лясной і дрэваапр. галінам: найбольшыя ў рэспубліцы *Барысаўскі фанера-вапалкавы камбінат*, дрэваапрацоўчы камбінат імя Каміntэрна, шпалапрапітны і лесахімічны з-ды, папяровая ф-ка, *Барысаўская фабрыка піяніна* імя 50-годдзя КПБ і з-д пластмасавых вырабаў. З-ды: гумава-тэхн. і хім. вырабаў, палімернай тары. *Барысаўскі шклозавод* імя Ф. Э. Дзяржынскага, хіміка-фармацэўтычны з-д, філіял Мінскага швейнага аб'яднання імя Крупскай, з-д зборнага жалезабетону, камбінат для перапрацоўкі другаснай сыравіны. Будуецца (1970) з-д гідрапомпаў і гідраўзмацняльнікаў руля. Харчовая прамысл.: мяса- і млынкамбінат, хлебакамбінат, макаронная ф-ка, піўзавод, малочны з-д.


Бярэзіна (з прытокам Схой) падзяляе горад на Стары і Новы Б. Паводле ген. плана (1966, арх. Р. Шэліхава) сучасным цэнтрам Б. сталі вул. Чапаева і плошча з 4—5-павярховымі жылымі дамамі і магазінамі, будынкам гарвыканкома, універмагам і інш. Пачынаецца забудова мікрараёнаў 5—9-павярховымі будынкамі, якія свабодна размяшчаюцца на мясцовасці і ўздоўж вул. Гагарына. Пастаўлены помнікі: У. І. Леніну; экіпажу танка П. М. Рака (1960, Т. Смяльчук); партызанцы Л. І. Чалоўскай (1958, скульптар С. Селіханаў, арх. Г. Калюжнер); сав. воінам, якія загінулі ў баях за Б.

У 1970 у Б. было 16 сярэдніх, 5 школ рабо-




Барысаў. Жылыя дамы каля вакзала.






Барысаглебская царква. 2-я пал. 12 ст. Агульны выгляд (злева), фрагмент апсіды (у цэнтры) і план.



Барысаў. Цэнтральная плошча.



чай моладзі, 33 дашкольныя ўстановы, Дом піянераў, станцыя юных тэхнікаў, станцыя юных натуралістаў, муз. і 2 дзіцячыя спарт. школы; мед. вуч., палітэхнікум, 4 прафесіянтэхн. вуч., 3 масавыя б-кі, Дом культуры, 10 клубаў, 3 кінатэатры, стадыён, Барысаўскі нар. тэатр, *Барысаўскі краязнаўчы музей*, 3 бальніцы, 7 паліклінік. Паблізу Б. санаторый «Блонь», пансіянат ветэранаў працы і Дом ветэранаў працы.

Літ.: Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии, в. 1, Мн., 1870; Клейн Э. М., Довгяло Д. И. и Белоцерковец Н. Е. Город Борисов, у кн.: Записки северо-западного отдела императорского русского географического общества, кн. 1, Вильна, 1910, с. 59—96; Самцэвіч Б. Барысаў, «Наш край», 1927, № 2; Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах, т. 1. IX—XVIII ст., Мн., 1936; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962; Богданович А. В. и Сидоров П. А. Города Белоруссии, Мн., 1967.

Г. В. Штыхаў, А. А. Фактаровіч (гісторыя), *І. І. Трухан* (гаспадарка), *Н. А. Зэльтэн* (архітэктура). Мінск.

БАРЫСАЎ Мікалай Барысавіч (н. 19.12. 1918, в. Чорная Грязь Парэцкага пав. Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. У Чырв. Арміі з 1938. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. На франтах Айч. вайны з снеж. 1941. Вызначыўся пры прарыве абароны праціўніка каля в. Замошша Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. Байцы стралковага батальёна, якім камандаваў маёр Б., 23.6.1944 пераадолелі 3 лініі варожых умацаванняў і з ходу захапілі г. п. Шуміліна. 24.6.1944 батальён пад агнём ворага фарсіраваў Зах. Дзвіну, захапіў плацдарм каля в. Забор'е, што дало магчымасць сав. войскам развіць наступленне, каб акружыць віцебскую групоўку ворага. Жыве ў вёсцы Архіпаўка Смаленскага р-на.

БАРЫСАЎ Міхаіл Сямёнавіч [22.1(4.2).1904, в. Барскае-Рыкава Вязнікаўскага пав. Уладзімірскай губ.— 9.2.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1926. У 1936 скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе. На фронце з лют. 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Кіева. Полк пад камандаваннем Б. ў лют. 1944 удзельнічаў у вызваленні Калінкавіч на тэр. Гомельскай вобл. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Калінкавічах.



БАРЫСАЎ Міхаіл Уладзіміравіч (н. 16.4. 1923, в. Нараўшчына Мазырскага пав.), Герой Савецкага Саюза (1945). З служачых. Чл. КПСС з 1944. У 1941 скончыў Гомельскі аэраклуб, у 1943 ваенна-марское вуч. У Айч. вайну лётчык па дастаўцы самалётаў на фронт. Са жн. 1944 у дзейнай часці Балтыйскага флоту. У вер. 1944 эскадрыллі, якою камандаваў Б., была пастаўлена задача — перашкодзіць гітлераўцам вывезці па моры групоўку, адрэзаную Сав. Арміяй каля Таліна. Большасць фаш. транспартаў была затоплена. Б. зрабіў 47 баявых вылетаў, затапіў 10 і пашкодзіў 2 транспарты, затапіў лінкор ворага «Шлезвіг-Гальштэйн». Служыць у Сав. Арміі.

БАРЫСАЎСКАЕ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАДПОЛЛЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнічала з пачатку ліпеня 1941 да канца чэрвеня 1944. Яго ўзначальвалі: Барысаўскі падпольны райком КП(б)Б (ліп. 1941 — люты 1942, сакратар І. А. Яраш; вер. 1942 — май 1943, сакратар А. І. Белісаў); Барысаўскі падпольны гаррайком КП(б)Б (май 1943 — чэрв. 1944, сакратар А. І. Белісаў, з жн. 1943 П. Ф. Смірноў). Барацьбой моладзі кіравалі: Барысаўскі падпольны райком ЛКСМБ (жн.— ліст. 1941, сакратар А. М. Сляпцоў; ліст. 1942 — чэрв. 1944, сакратары С. С. Сахончык, У. Ф. Віторскі, П. Ф. Грышановіч), Барысаўскі падпольны гаррайком ЛКСМБ [кастр. 1942 — чэрв. 1944, сакратар Г. П. Дзятлава, з чэрв. 1943 У. Дз. Бухарын (Гранаў)]. Дзейнасць падполля накіроўвалі: *Мінскі падпольны абком КП(б)Б*, Барысаўскі падпольны міжраённы камітэт КП(б)Б (жн. 1942 — май 1943, сакратар П. А. Жуковіч), Мінскі падпольны абком ЛКСМБ (чэрв. 1943 — чэрв. 1944, сакратары С. І. Пармон, П. Е. Папоў, Я. М. Канаплін; адказны арганізатар па Барысаўскай зоне Дз. В. Лёля), Барысаўскі падпольны міжрайком ЛКСМБ (жн. 1942 — май 1943, сакратар Я. І. Гуля). У стварэнні падполля і кіраўніцтве ўдзельнічалі ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б і БШПР Т. С. Радзюк, інструктар ЦК ЛКСМБ па Мінскай вобл. А. Ю. Дзенісевіч, чл. Барысаўскага падп. міжрайкома КП(б)Б В. С. Пыжыкаў, сакратар Барысаўскага падпольнага гаррайкома КП(б)Б П. Ц. Солдак, чл. М. М. Чуліцкі, пам. сакратара А. Ю. Хацевічык, інструктары Г. Р. Каўзановіч, А. Д. Кручок, І. А. Шыдлоўскі.

У ліп. 1941 Яраш праз І. Я. Паўловіча, М. М. Шуцкую, І. Л. Ермаковіча, Дз. Ц. Канашэвіча, Н. В. Бялкову наладзіў сувязь з камуністамі-падпольшчыкамі Т. Н. Крывушам, У. А. Качаном, Дз. М. Карнелюком, А. М. Карнеевым, Л. В. Арловым, В. М. Старадзеткам. На кватэрах В. П. і У. А. Качаноў, Т. К. Ермаловіча, К. І. Ржавуцкага, Л. В. Арлова, Л. І. *Чалоўскай*, М. С. Жукоўскай наладжаны падпольныя яўкі. На гуце, у У. А. Качана, П. Г. Паўлаўца, Ю. М. Фіндзэінай, Э. А. Шапчыц, Г. М. Стракалава і інш. былі ўстаноўлены радыёпрыёмнікі. Адну з першых падпольных груп стварылі І. П. Даўгалаў (Далгалаў) і У. У. Лазоўскі на гуце. У яе ўваходзілі Б. К. Замбржыцкі, К. І. Ржавуцкі, Р. Ф. Чарноў, В. П. Качан, М. І. Прыры, С. М. Манкевіч і інш. З дапамогай членаў гэтай групы райком стварыў новыя арг-цыі і пакіроўваў іх дзейнасць. Да пач. кастр. 1941 у Барысаве было 17 груп, у т. л. на эл. станцыі, чыгунцы, у бальніцы, на з-дзе «Каміntэрн», запалкавай ф-цы, у Стара-Барысаве, у пям. установах, камсамольска-маладзёжная, б. ваеннаслужачых і інш. Чл. падполля В. В. Карнюшка, А. Р. Філіповіч, Д. В. Яшчанка, І. І. Хадасевіч, Ю. І. Лукомская, якія па заданні райкома працавалі ў пям. установах, забяспечвалі падпольшчыкаў і партызанаў пашпартамі, прапускамі, прадуктовымі карткамі, перадавалі ім звесткі разведкі пра аб'екты і сілы ворага, выратоўвалі людзей ад вывазу на катаржныя работы ў Германію. Б. К. Замбржыцкі, уладкаваўшыся кіраўніком аддзела аховы здароўя гар. управы, падабраў у мед. ўстановы надзейных людзей і стварыў падпольную групу з цэнтрам на санэпідстанцыі (І. Л. Бардушка, М. І. Прырыз, Г. Т. Пушкіна, М. М. Комар, А. І. Сталярова і інш.). Яны перадавалі партызанам медыкаменты, зброю, распаўсюджвалі ваўкі Саўінфармбюро, лістоўкі, арганізоўвалі ўцёкі і перапраўлялі да партызанаў ваеннапалонных, склалі план агнявых кропак ворага ў горадзе. Група медыкаў — П. М. Вусцін (кіраўнік), Г. І. Астроўская, М. І. Баранава, М. М. Раманоўская, А. С. Малевіч і інш.— у нелегальным шпіталі вылечыла 60 параненых сав. воінаў і пераправіла іх да партызанаў. Падпольшчыкі на чыгунцы — Д. Б. Вярэка, Ф. А. Валёк, Дз. Лебедзеў, П. Токараў, Н. П. Токарава («Патрыёт»), Дз. М. Іаселіяні перадавалі партызанам звесткі пра рух варожых эшалонаў, падкладвалі ў паравозы міны, псавалі абсталяванне, узарвалі тэлефонную калону «Бокс», праз якую фашысты трымалі сувязь з франтам. Група з б. ваеннаслужачых — С. М. Ігумнаў (кіраўнік), П. В. Яхантаў, М. П. Ермаловіч, А. М. Сідзяеў, П. Т. Церахаў, Э. Г. і Л. І. Буцвілоўскія, усяго больш за 20 чал.— вырабляла міны, наладжвала дыверсіі, выводзіла ў партызаны ваеннапалонных. Камуністы Ф. П. Падалян, А. К. Саламаціп кіравалі дзейнасцю групы піянераў (Міхаіл Буцвілоўскі, Аляксандр Клімковіч, Віктар Пашкевіч, Валянціна Сакалова), якая здабыла для партызанаў 263 вінтоўкі, 25 аўтаматаў, 21 кулямёт, многа патронаў, толу, узарвала 3 эшалоны, склад з пям. абмундзіраваннем, бензабак. Падпольшчыкі на з-дзе «Каміntэрн», эл. станцыі, хлебазаводзе і інш. прадпр.— С. М. Манкевіч, М. Т. Сманцар, А. І. Піваваравў, А. Ф. Самарадаў, А. Г. Буланаў, А. Хаўстаў, П. Г. Паўлавец, Г. М. Стракалаў і інш.— зніштчалі аўтамашыны, электраматоры, псавалі абсталяванне, неадпойчы выводзілі са строю эл. станцыю. А. Дз. Дзмітрыеў, А. Дз. Хацкевіч, В. К. Палонік на запалкавай ф-цы ўзарвалі цэхі, дзе выраблялісь міны. Камсамольска-маладзёжная група — Б. П. Кавчан (кіраўнік), М. А. Капшай, М. А. Карнееў, А. І. Ржавуцкі, Л. І. Чалоўская, Э. А. Шапчыц, У. Кавалёў, В. Кудраўцаў, М. Гайдук — вяла паліт. работу сярод насельніцтва, разведку, учыняла дыверсіі, збірала і перадавала партызанам зброю і боепрыпасы. У ліст. 1941 яна ўлілася ў групу Даўгалава і Лазоўскага. Група А. Я. Мухіна («Южны») — І. Н. Дэмскі, К. М. Мухіна, П. Ф. Парабковіч, М. П. Паўловіч, С. І. Сіняўскі і інш.— выконвала заданні спецгрупы «Актыўныя». Групы Р. Сарокі і А. Бухава — У. А. і Р. К. Баркуны, А. Е., Н. В. і М. В. Бялковы, А. Г. Данілава, А. П. і А. К. Капцэвічы, В. М. Кончык, Г. І. Кулікава, С. І. Лушчык (Анохіна), К. А. Міларадава, В. В. Сцяпурка (Бялкова), М. В. Фірсаў («Мірон»), А. М. Францкевіч, Ф. У. Цярэшчанка і інш.— выконвалі заданні ваен. разведкі Зах. фронту. Група Т. П. Гук (Дзягель) — В. А. Гурыновіч, Н. і А. Кошкіны, А. Ляшкевіч, М. Г. Мазінг, С. І. Ржавуская, С. Садоўскі — вяла разведку па даручэнні *партызанскай брыгады 1-й Беларускай*. У Барысаўскім р-не найбольш дзейныя былі Бараўлянская, Бродаўская, Вялікастаўская, Жыцькаўская, Замошская, Лошніцкая, Навасёлкаўская, Неманіцкая падпольныя арг-цыі. Арг-цыі падполля трымалі сувязь з партыз. брыгадамі (гл. адпаведныя арт.): «Дзядзькі Колі», «Старога», «Разгром», імя Панамарэнкі, імя Шчорса, імя Кірава, «Смерць фашызму», з *партызанскім атрадам імя А. В. Суворава*, з спецгрупамі. Разам з партызанамі падпольшчыкі правялі некалькі вялікіх аперацый: узарвалі ў Барысаве мост на аўтамаб. магістралі Брэст — Масква (кастр. 1943, узарваў камуніст С. М. Кніга), 7 складаў са зброяй, боепрыпасамі і абмундзіраваннем, бензасклад, фельдкамендатуру, зенітную гармату, зніштчылі каля 200 гітлераўцаў, у т. л. генерала (ліст. 1943), узарвалі 2 паравозы, 3 платформы з зап. часткамі да танкаў (снеж. 1943), выявілі школу «Абвера» ў пас. Печы і яе філіял у прыгарадзе Барысава, зніштчылі фельдкаменданта Барысава, вывелі да партызанаў нач. барысаўскага аддзялення контрразведкі штаба 4-й пям. арміі, які перадаў важныя дакументы. У друкарні падпольных райкома і гаркома КП(б)Б, створанай А. Ф. Забалоцкім, Д. Ф. Капытковым, Н. А. Левашовай, М. І. Сыраваткам, П. М. Юроўскім, падпольшчыкі надрукавалі і распаўсюдзілі 158 300 экз. газет, лістовак, адозваў. У Барысаўскай зоне на 1.8.1943 падполле аб'ядноўвала 32 партарганізацыі, больш за 300 камуністаў; 218 камсамольскіх арг-цый (1119 чл.), 136 камсамольцаў выконвалі асобныя заданні і працавалі ў адзіночку.

У барацьбе з пям. фашыстамі загінулі падпольшчыкі Л. В. Арлоў, І. Л. Бардушка, Бабіцкая, Т. П. Гук, І. П. Даўгалаў, І. Н. Дэмскі, П. А. Жуковіч, Б. К. Замбржыцкі, А. М. і М. А. Карнеевы, В. В. Карнюшка, Дз. М. Карнялюк, У. А. і Б. П. Качаны, Т. Н. Крывуш, М. М. Комар, Р. Х. Крупкін, У. У. Лазоўскі, Ю. І. Лукомская, С. М. Манкевіч, Р. Носаў, В. К. Палонік, П. Ф. Парабковіч, І. Я. Паўловіч, Г. Т. Пушкіна, А. І. і К. І. Ржавуцкія, В. М. Старадзетка, В. В. Сцяпурка, П. Токараў, Н. П. Токарава, А. С. Федарынчык, А. Р. Філіповіч, М. В. Фірсаў, А. М. Францкевіч, Ф. У. Цярэшчанка, Л. І. Чалоўская, В. П., Н. П. і П. П. Чарнухі, М. М. Шуцкая, І. А. Яраш, Д. В. Яшчанка і інш.

Многія падпольшчыкі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. У в. Крынічкі (б. Пупелічы), Зачысце на магілах членаў падпольнага райкома і партызанаў пастаўлены абеліскі. У Барысаве на праспекце Рэвалюцыі — помнік Л. І. Чалоўскай, мемарыяльны сквер і помнік ахвярам фашызму. На будынках Барысаўскага РК КПБ, гуты, дрэваапрацоўчага камбіната «Камінтэрн», вакзала і б. эл. станцыі — мемарыяльныя дошкі.

Літ.: Мачульский Р. Вечный огонь. Партизанские записки, 2 изд., Мн., 1969; Калинин П. Партизанская республика, 2 изд., Мн., 1968; Жангельдин Т. Дневник партизана, Алма-Ата, 1965; Милорадова К. В разведке, М., 1966. *М. І. Сыраватка.* Мінск.


БАРЫСАЎСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП(б), утварылася ў снеж. 1904 з рабочых — прыхільнікаў ленінскай «Искры». Уваходзіла ў *Паўночна-Заходні саюз РСДРП*, пазней у *Абласны саюз РСДРП Літвы і Беларусі*. Адзін з яе арганізатараў бальшавік А. І. Баршай. Мела друкарню, кіравала работай 5 прапагандысцкіх гурткоў, якія наведвала больш за 100 слухачоў. Да ліп. 1905 распаўсюдзіла лістоўкі 11 назваў, многа брашур, у т. л. працу У. І. Леніна «Да вясковай беднаты», газ. «Вперед» і «Пролетарий». Пад кіраўніцтвам Б. а. са студз. да ліп. 1905 адбылося 8 забастовак і стачак, якія закончыліся частковай перамогай рабочых. У час забастоўкі рабочых запалкавай ф-кі «Віктория» і ф-кі «Бярэзіна» (16—18.1.1905) арг-цыя выпусціла лістоўку «Да ўсіх барысаўскіх рабочых і работніц» з заклікам рашуча змагацца за паляпшэнне свайго становішча. Падтрымлівала сувязь з Мінскай групай РСДРП, якая прысылала ў Барысаў сваіх прадстаўнікоў. Дэлегат ад Б. а. прымаў удзел у рабоце другой канферэнцыі арганізацый РСДРП Паўночна-Заходняга краю (ліст. 1905). У часы рэакцыі былі арыштаваны многія чл. групы, у т. л. адзін з яе кіраўнікоў І. Н. Вярбіцкі. У снеж. 1908 паліцыя выкрыла падпольную бібліятэку, адрасы явак у Вільні, Мінску, Бабруйску, падпісны ліст для збору сродкаў на карысць РСДРП. Гэта надоўга спыніла работу Б. а. РСДРП(б). У 2-й пал. ліп. 1917 з дапамогай Мінскага к-та РСДРП(б) у Барысаве створана парт. ячэйка з 15 чал. (старшыня — каваль Карнавухаў).

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920 гг.), 2 изд., Мн., 1968; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962. *У. І. Салашэнка.* Магілёў.

БАРЫСАЎСКАЯ ГРАДА, паўн.-ўсх. прыгар Мінскага ўзвышша, адасоблены ад яго ўчасткам Верхнебярэзінскай нізіны па ніжнім цячэнні р. Гайна. Марэнны рэльеф сфарміраваўся ў час маскоўскага абледзянення. Складзены з суглінкаў і супескаў, месцамі перакрытых лёсападобнымі пародамі. Лясы пераважаюць на паўн.-ўсх. схілах. Плошча ворных зямель памяншаецца з ПдЗ на ПнУ. Карысныя выкапні — гліны і торф.

БАРЫСАЎСКАЯ ФАБРЫКА ПІЯНІНА імя 50-годдзя Кампартыі Беларусі, прадпрыемства мясцовай прамысловасці. Асноўная прадукцыя — піяніна, дзіцячыя ксілафоны. Створана на базе лесакамбіната ў 1935. Да 1941 выпусціла 956 піяніна. У Айч. вайну разбурана. Пасля аднаўлення ў 1946 выпушчана 10 піяніна, у 1950 — 1242, 1960 — 11 700, 1969 — 18 114. У 1969 асвоена вытворчасць 10 новых вырабаў, у т. л. піяніна «Беларусь-6», дзвюхактаўны ксілафон, цымбалы і інш. Пры ф-цы піянерскі лагер, дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

М. А. Кудзін. Барысаў.




Аддзелачны цэх.

БАРЫСАЎСКІ КАЛГАСНА-САЎГАСНЫ ТЭАТР. Створаны ў 1935 з драм. гуртка (існаваў з 1932). Маст. кіраўнік П. *Данілаў*. У рэпертуары: «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага, «Слава» В. Гусева, «Пагранічнікі» У. Біль-Белацаркоўскага, «Партызаны» К. Крапівы, канцэртныя праграмы. У 1938 т-р пераведзены ў Заслаўе і стаў наз. *Заслаўскі калгасна-саўгасны тэатр*.

БАРЫСАЎСКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ. Адкрыты ў 1950 у Барысаве. У фондах і 5 экспазіцыйных залах (пл. 255 $м^2$) больш за 4 тыс. экспанатаў. 2 аддзелы: гісторыя дасав. і сав. перыядаў; ствараецца аддзел прыроды краю. У аддзеле гісторыі дасав. перыяду археал. знаходкі з раскопак на Барысаўшчыне; дакументы часоў Вял. кн. Літоўскага і Рэчы Паспалітай; рэліквіі Айч. вайны 1812. На стэндах «Партыз. рух у Айч. вайну 1812», «Разгром напалеонаўскіх войск на Бярэзіне» — рус. і франц. зброя, амуніцыя, знойдзеныя на месцах баёў пад Барысавам; карты, планы, фотакопіі найб. важных дакументаў. Сярод экспанатаў этнагр. матэрыялы 19 — пач. 20 ст. У аддзеле гісторыі сав. перыяду адлюстраваны падзеі Кастр. рэв. на Беларусі, барацьба за ўладу Саветаў на Барысаўшчыне ў грамадз. вайну — дакумент. матэрыялы пра рэвалюц. выступленні сялян павета пасля Лют. рэвалюцыі 1917, пра дзейнасць Барысаўскага павятовага выканкома і партыз. рух на Барысаўшчыне ў гады акупацыі кайзераўскімі войскамі і бурж. Польшчай, пра ўдзел Р. К. Арджанікідзе ў арганізацыі наступлення сав. войск пад Барысавам у 1919, пра вядомых землякоў Я. А. *Адамовіча*, А. І. *Хацкевіча* і інш. У тэме Вял. Айч. вайны 1941—45 фотаздымкі і дакументальныя матэрыялы пра дзейнасць *Барысаўскага камуністычнага падполля* і яго кіраўнікоў, пра партыз. рух на Барысаўшчыне, у т. л. пра *партызанскую брыгаду «Дзядзькі Колі»* і яе камандзіра П. Р. *Лапаціна*, пра вызваленне Барысаўшчыны ў выніку *Беларускай аперацыі 1944*, у т. л. стэнды пра воінаў, якія вызначыліся пры вызваленні Барысава — танкавы экіпаж П. М. Рака, лётчыц 125-га гвардзейскага авіяпалка імя Расковай, франц. лётчыкаў палка «Нармандыя — Нёман», і інш. У раздзеле пасляваен. сацыяліст. буд-ва — узоры прадукцыі прамысл. прадпрыемстваў Барысаўшчыны, матэрыялы пра дасягненні працоўных горада і раёна, пра Герояў Сац. Працы Г. К. *Вяржбіцкую* і А. Дз. *Кажамякіна*. Сярод экспанатаў, прысвечаных пісьменнікам-барысаўчанам, — аўтарскі рукапіс Дзярж. гімна БССР М. *Клімковіча*. Ад музея пачынаецца турысцкі маршрут на в. Студзёнка і Брылі — месца разгрому франц. войск на Брылеўскім полі, дзе ў 1962 у гонар 150-годдзя перамогі рус. воінаў пастаўлены помнік-манумент. У 1969 музей наведала 15 тыс. чал.

М. І. Сыраватка. Мінск.

Будынак Барысаўскага краязнаўчага музея.







Вуліца ў вёсцы Лошніца.

БАРЫСАЎСКІ РАЁН, у складзе Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на ПнУ вобл., па абодвух баках Бярэзіны (прыток Дняпра). Пл. 3,0 тыс. $км^2$. Нас. 148,6 тыс. чал. (з Барысавам, 1969). Падзяляецца на 22 сельсаветы. Цэнтр г. Барысаў.

Рэльеф раёна пераважна раўнінны. На Пд Цэнтральнабярэзінская раўніна, складзеная з водналедавіковых пяскоў і супескаў, на ПнЗ плоская забалочаная Верхнебярэзінская нізіна. Паміж імі з ПдЗ на ПнУ праходзіць вузкая палоса Мінскага ўзв. — Барысаўская марэнная града. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу — 19,8 млн. *т* (у т. л. радовішча Гайна-Бродня — 12,6 млн. *т*), 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 6,2 млн. $м^3$ (у т. л. радовішча каля в. Вароўскага — 5,0 млн. $м^3$), 3 радовішчы цагельных глінаў — 0,8 млн. $м^3$ (у т. л. радовішча Загор'е — 0,6 млн. $м^3$). Сярэдняя т-ра студз. — 6,8, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 653 *мм* за год. Вегет. перыяд 187 дзён. З ПнЗ на ПдУ па тэрыторыі раёна цячэ Бярэзіна з найб. прытокамі Гайна, Пліса — справа, Сха і Бобр — злева. На Пн воз. Палік. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (67,2%), у т. л. залішне ўвільготненыя (12,2%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (7,8%), дзярнова-глеяватыя і алювіяльна-дзярновыя (9,0%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя тарфяна-балотныя (16,0%). З мінер. глебаў 43,5% суглінкавых, 55,3 супясчаных, 1,2% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 51 (цана бала 0,23 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 26,

Краявід каля Барысава.





усіх с.-г. угоддзяў — 39. Пад лесам 52% тэрыторыі, пераважае хвоя, з лісцевых бяроза, вольха, асіна. На Пн раёна вялікі лясны масіў *Бярэзінскага дзяржаўнага запаведніка*. Раён насяляюць беларусы, ёсць рускія, украінцы, яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. нас. 50 чал. на 1 км² (з Барысавам), сельскага 24 чал. на 1 км².

Прамысловасць сканцэнтравана пераважна ў Барысаве. У раёне на мясц. сыравіне працуюць: торфапрадпр. «Ганцавічы» і «Паша», цагельні «Студзёнка», «Зембінская» і «Забалоцце», крухмальны з-д «Весялова», малочны з-д, лясгас, хімлясгас, леспрамгас. Для раёна важнае значэнне маюць райпрамкамбінат, гарадскі камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Прыяміnскі аўтарамонтны з-д. У раёне 17 калгасаў і 17 саўгасаў (1970).

Калгасы і іх цэнтры: «Зара камунізма» *(Зембін)*, «Іскра камунізма» *(Вялікае Стахава)*, імя Калініна *(Баяры)*, «Камінтэрн» *(Карсакавічы)*, імя Куйбышава *(Сівіца)*, імя Кутузава *(Касцюкі)*, імя Леніна *(Кімія)*, «Маяк камунізма» *(Маяк камунізма)*, «Новае жыццё» *(Азярэцічы)*, «1 Мая» *(Перасады)*, імя Свярдлова *(Пагадзіца)*, імя Суворава *(Забалоцце)*, імя Чкалава *(Халхоліца)*, «Чырвоная Беларусь» *(Неманіца)*, «Чырвоная зорка» *(Кішчына Слабада)*, «Чырвоны наваселец» *(Навасёлкі)*, «Шлях Леніна» *(Гліэін)*.
Саўгасы і іх цэнтры: «Боркі» *(Зачысце)*, «Бродаўка» *(Кастрыца)*, «Вяляцічы» *(Вяляцічы)*, «Гвардыя» *(Вялікая Ухалода)*, «Замошша» *(Іканы)*, «Кіраўскі» *(Майсеевічына)*, «Лошніца» *(Лошніца)*, «Максімаўка» *(Навасёлкі)*, «Мётча» *(Мётча)*, «Мсціж» *(Мсціж)*, «Нівкі» *(Нівкі)*, «Перадавік» *(Сморкі)*, «Радуга» *(Забашавічы)*, «Стара-Барысаў» (пас. *Стара-Барысаў*), «Траянаўка» *(Траянаўка)*, імя Чапаева *(Палялюм)*, «Чырвона-партызанскі» *(Жортай)*.


С. гасп. спецыялізуецца на гадоўлі буйн. раг. жывёлы малочна-мяснога кірунку, свінагадоўлі, ільнаводстве, бульбаводстве і агародніцтве. Пад с.-г. ўгоддзямі 35,8% тэрыторыі. Значная частка с.-г. угоддзяў, асабліва на Пн, залішне ўвільготнена і забалочана. На 1.1.1970 асушана 13,2 тыс. га. Агульная пасяўная пл. (тыс. га, 1969) — 66,4, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 29,0 (пераважна азімае жыта, азімая пшаніца, ячмень, авёс, грэчка і інш.), тэхнічнымі (лён і цукр. буракі) 3,6, бульбай 13,2, пад кармавымі культурамі 19,9. У 1970 было (тыс. гал.): буйн. раг. жывёлы 56,3, у т. л. кароў 29,7; свіней 45,6; авечак і коз 6,3. Тэр. раёна перасякаюць чыгунка і шаша Масква — Брэст, шашэйныя дарогі ад Барысава да Бягомля, Плешчаніц і інш. Бярэзіна ў межах раёна суднаходная і сплаўная.

На пач. 1970 у раёне (без Барысава) 21 сярэдняя, 34 васьмігадовыя, 71 пач. школы, 2 школы рабочай і сельскай моладзі, школа-інтэрнат, 16 дашкольных устаноў, сельскае прафесіян.-тэхн. вуч.; 61 масавая б-ка, 59 клубных устаноў, 57 кінаўстановак, у т. л. 48 стацыянарных; 9 бальніц, 36 фельч.-ак. пунктаў, раённая паліклініка; санаторый «Блонь», 4 піянерскія лагеры. У 1970 у раёне (без Барысава) працавала 636 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 25 інжынераў, 46 аграномаў, 23 заатэхнікі, 31 вет. ўрач, 23 эканамісты, 51 урач, 413 настаўнікаў; 984 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Газ. «Камуністычная праца» (раённая і гарадская). *І. І. Трухан.* Мінск.

БАРЫСАЎСКІ ТРАМ, Барысаўскі тэатр рабочай моладзі. У 1933—35 дзейнічаў у Барысаве. Рэж. Сямёнаў. У рэпертуары — «Новы горад» І. Гурскага, «Узнятая цаліна» паводле М. Шолахава, «Шторм» У. Більбасаўскага, «Гармонік» паводле М. Жарава, «Цудоўны сплаў» У. Кіршона, п'есы малых формаў. У 1935 спыніў сваю дзейнасць.

БАРЫСАЎСКІ ФАНЕРА-ЗАПАЛКАВЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства дрэваапрацоўчай прамысловасці. Мае 12 асноўных і дапаможных цэхаў, выпускае каля 30 відаў прадукцыі: запалкі, фанеру, мэблю, драўнінна-валакністыя плітыі і інш. вырабы. Узнік на базе заснаванай у 1901 запалкавай ф-кі «Бярэзіна». Рабочыя ф-кі пяраз (1903, 1905, 1907) арганізоўвалі стачкі, патрабуючы палепшыць умовы працы. Пасля Кастр. рэв. па прапанове рабочых ф-ка стала называцца «Чырвоная Бярэзіна». У 1925 выпушчана 116,3 тыс. скрынак запалак. У 1929 уступіла ў строй новая запалкавая ф-ка «Пралетарская перамога», а ф-ка «Чырвоная Бярэзіна» перабсталявана пад фанерны з-д. У Айч. вайну ф-ка і з-д поўнасцю разбураны, а пасля аднаўлення ў 1946 аб'яднаны ў фанера-запалкавы камбінат. У 1950 пабудаваны новы фанерны з-д, які таксама ўвайшоў у склад камбіната. З 1959 выпускаецца і мэбля з гнутаклееных дэталяў. На адходах вытворчасці працуе цэх цвёрдых драўнінна-валакністых пліт. У 1969 выпушчана 1481,1 тыс. скрынак запалак, 18,3 тыс. м³ фанеры. Пры камбінаце клуб, дзіцячая муз. студыя, піянерскі лагер, яслі-сад. *Ч. І. Пухальскі.* Барысаў.

БАРЫСАЎСКІ ШКЛОЗАВОД імя Ф. Э. Дзяржынскага, адзін з найбуйнейшых шклозаводаў у СССР. Асн. прадукцыя — посуд: шклянкі, графіны, вазы, збанкі, фужэры, сподкі пад варэнне, куфлі, а таксама сувеніры і інш. — усяго каля 300 відаў вырабаў з бясколернага, каляровага, двухслаёвага шкла і крышталю. Засн. ў 1898. Пасля Кастр. рэвалюцыі рэканструяваны. Да 1941 выпускаў больш за 320 відаў вырабаў. У Айч. вайну разбураны. У 1945 адноўлены, у 1947 выпуск прадукцыі дасягнуў даваеннага ўзроўню. У 1966 пушчаны цэх каляровага посуду і крышталю, у 1967 цэх бясколернага шкла, у 1969 — цэх маст. шкла.



Канвеер па вырабе карабкоў.

Барысаўскае мастацкае шкло.



Вытворчасць паточная, працэс шкловарэння аўтаматызаваны. Вырабы ўпрыгожваюцца алмазнай гранню, гравіроўкай, золатам і інш. У 1969 выпушчана прадукцыі на 5,5 млн. руб. — у 2,5 раза больш, чым у 1958. Прадукцыя экспартуецца ў многія краіны свету. Найлепшыя ўзоры экспанаваліся на міжнар. выстаўках і кірмашах (у Канадзе, Генуі, Будапешце, Бруселі, Лейпцызе, Парыжы і інш.). Пры з-дзе піянерскі лагер, дзіцячыя дашкольныя ўстановы. *А. С. Кароль.* Барысаў.

БАРЫСАЎШЧЫНА, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр сельсавета. За 10 км на Пн ад Глуска, 160 км ад Магілёва, 35 км ад чыг. ст. Ратміравічы. 431 ж., двароў 130 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 26 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Побач з вёскай на беразе р. Камарынкі выяўлены паселішчы бронзавага веку і 6—9 ст.

БАРЫСАЎШЧЫНА, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Барысаўшчына». За 12 км на З ад Хойнікаў, 122 км ад Гомеля, 17 км ад чыг. ст. Хойнікі, 20 км ад прыстані Ламачы на р. Прыпяць. 936 ж., двароў 299 (1970). Пач. школа, б-ка, дзіцячыя яслі, фельч.-ак. пункт, сталовая, 2 магазіны, швейная майстэрня.

БАРЫСЕВІЧ Аляксандр Іванавіч [н. 1(14).8.1914, Мінск], перадавік вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Айч. вайны. У 1930—41 шафёр гомельскай аўтарамонтнай майстэрні. З 1945 на Гомельскім аўтарамонтным з-дзе: шафёр, з 1954 майстар па рамонце аўтобусаў.

БАРЫСЕВІЧ Вольга Міхайлаўна [21.6(4.7).1903, Порт-Артур — 13.9.1947], беларускі савецкі рэжысёр. Чл. КПСС з 1940. Скончыла Бел. тэатр. студыю ў Маскве (1926). У 1926—31 артыстка БДТ-2 (т-р імя Я. Коласа). У 1931—33 рэжысёр-асістэнт Бел. студыі оперы і балета, 1933—41 і 1943—47 рэж. Бел. т-ра оперы і балета, на сцэне якога паставіла оперы «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага (1933), «Севільскі цырульнік» Дж. Расіні (1934), «Трыльбі» А. Юрасоўскага (1940), «Казкі Гофмана» Ж. Офенбаха (1941), «Чыо-Чыосан» Дж. Пучыні (1945), «Русалка» А. Даргамыжскага (1946). Работы Б. вызначаліся пошукамі ў галіне сцэнічнай формы, яркай творчай фантазіяй. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

БАРЫСЕВІЧ Іван Андрэевіч [н. 13(26).3.1917, в. Аляксандраўка Краснаярскай акругі Енісейскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1939. На фронце з 1942. Змагаўся на Зах., Брацскім, 2-м Бел. франтах. Вызначыўся ў баях за вызваленне Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. 22.2.1944. Каля в. Янава ў час варожай контратакі Б. агнём гарматы падбіў 2 танкі. 25—28.3.1944 разлік гарматы, якім камандаваў Б., адбіў некалькі варожых контратак і ўтрымаў важную ваен. пазіцыю. Жыве ў Краснаярску.

БАРЫСЕВІЧ Мікалай Аляксандравіч (н. 21.9.1923, пас. Лучны Мост Ігуменскага пав. Мінскай губ.), беларускі савецкі фізік. Акад. АН БССР (1969, чл.-кар. 1966), прэзідэнт АН БССР (14.5.1969). Чл. КПСС з 1945. Удзельнік Айч. вайны і партыз. руху на Беларусі. Скончыў БДУ у 1950. У 1955—69 нам. дырэктара і з 1955 кіраўнік лабараторыі фізікі інфрачырвоных прамянёў Ін-та фізікі АН БССР, з 22.1.1969 віцэ-прэзідэнт АН БССР. Асн. навук. працы ў галіне люмінесцэнцыі складаных малекул у газавай фазе, інфрачырвонай спектраскапіі і квантавай электронікі. Распрацаваў антычныя метады вызначэння тэмпературы ўзбуджаных малекул, вагальнай цеплаёмістасці, частаты інверсіі і селектыўнай энергіі. Выявіў аслабленне флуарэсцэнцыі пары пабочнымі газамі. Зрабіў значны ўклад у вырашэнне праблемы антыстоксавай флуарэсцэнцыі. Вызначыў залежнасць інтэгральных інтэнсіўнасцей інфрачырвоных палос паглынання ад тэмпературы, стварыў новы тып *дысперсійных фільтраў* для інфрачырвонай зоны спектра. Распрацаваў метад знаходжання антычных пастаянных крышталяў, прапанаваў квантавыя генератары з селектыўнымі стратамі. Дэп. Вярх. Савета СССР 7—8-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі, а таксама медалямі.



Тв.: Внутримолекулярное перераспределение колебательной энергии в возбужденном электронном состоянии, у кн.: Элементарные фотопроцессы в молекулах, М.—Л., 1966; Возбужденные состояния сложных молекул в газовой фазе, Мн., 1967; (у сааўт.) Исследование инфракрасных дисперсионных фильтров, «Журнал прикладной спектроскопии», 1968, т. 8 (в. 4), т. 9 (в. 3).

Літ.: М. А. Барысевіч — прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР, «Весці АН БССР. Сер. фіз.-матэм. навук», 1969, № 3.

БАРЫСЕНКА Васіль Васілевіч [н. 12(25).4.1904, г. Нова-Барысаў], беларускі савецкі літаратуразнавец. Акад. АН БССР (1969, чл.-кар. 1957), д-р філал. н. і праф. (1956). Чл. КПСС з 1928. З рабочых. Скончыў БДУ (1929). У 1924—26 настаўнік, у 1932—37 дэкан літ. ф-та і дац. Мінскага пед. ін-та. Удзельнік Айч. вайны. Друкуецца з 1932. Асн. працы пра развіццё рэалізму ў бел. л-ры, пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, П. Трусава, Т. Шаўчэнкі і інш. Аўтар (з В. У. Івашыным) падручніка для 8 кл. «Беларуская літаратура» (10-е выд., 1969). Складальнік



хрэстаматый: для пед. вучылішчаў «Беларуская літаратура (дакастрычніцкі перыяд)» (1953), для 10 кл. «Родная літаратура» (14-е выд., 1961), зб. «Беларуская дакастрычніцкая проза» (1965), «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1967), сааўтар і навук. рэдактар «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1—2, 1964—66), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1—2, 1968—69), «Нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры» (1956). У 1937—41, 1946—50 і з 1952 — дырэктар Ін-та л-ры АН БССР. Узнаг. 4 ордэнамі, а таксама медалямі.

Тв.: Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя, Мн., 1957; [з В. У. Івашыным] Ролл рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст., Мн., 1963.

БАРЫСЕНКА Уладзімір Аляксандравіч [н. 25.1(7.2).1912, в. Пеніца Мазырскага пав. Мінскай губ.], Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1931. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. З першых дзён Айч. вайны на Ленінградскім фронце; камандаваў артыл. палком, удзельнічаў у прарыве блакады Ленінграда, у вызваленні Прыбалтыкі, Беларусі. Вызначыўся ў люг. 1944 пры прарыве варожай абароны на р. Нарве. Жыве ў Ленінградзе.



БАРЫСЕНАК Барыс Васілевіч (н. 22.7.1934, Беразіно Мінскай вобл.), беларускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1969). Скончыў Бел. дзярж. тэатр.-маст. ін-т (педагог Дз. Арлоў). З 1956 у Бел. рэсп. т-ры юнага гледача. Выканаўца драм. і характарных роляў. Найб. значныя: Адась, Васіль («Папараць-кветка», «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела), Шура Гараеў («Учора ў Касаткіне» А. Зака і І. Кузняцова), Бобчынскі («Рэвізор» М. Гогаля), Станіслаў Берсан («Чырвоны губернатар» У. Мехава), Максім Багдановіч («Зорка Венера» Б. Бур'яна і М. Алтухова), кароль Людовік XIII («Тры мушкецёры» паводле А. Дзюма).

БАРЫСІК Васіль Іванавіч (н. 2.8.1926, в. Горнае Бабруйскай акругі), перадавік вытворчасці, засл. меліяратар БССР (1966), Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1962. Удзельнік Айч. вайны. З 1951 працуе меліяратарам, з 1961 старшы машыніст экскаватара Старадарожскага буд.-мантажнага ўпраўлення меліярацыі. Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл.

БАРЫСФЕН (Borysthénēs), 1) назва р. Дняпра ў творах старажытнагрэчаскіх і рымскіх гісторыкаў (Герадот, Страбон, Пліній Старэйшы і інш.). У сваёй аснове слова Б. не грэчаскае, яно паходзіць, верагодна, ад славянскай мясцовай назвы тыпу «Бераzіn», «Берасцін». З падобнымі назвамі многа рэк (Бярэзіна — прытокі Дняпра, Нёмана; Берасціна ў басейне Днястра і інш.). У старажытнасці Б. — важная магістраль грэкаскіфскага гандлю. 2) Старажытнагрэчаская назва г. Ольвіі (6 ст. да н. э. — 5 ст. н. э.), які знаходзіўся на правым беразе Дняпроўска-Бугскага лімана.

БАРЫТ (ад грэч. báros цяжар), ц я ж к і ш п а т, мінерал, сульфат барыю $BaSO_4$. Мае 65,7% BaO. Крышталі таблітчастыя, прызматычныя, слупкаватыя рамбічнай сістэмы. Звычайна ў зярністых агрэгатах. Колер найчасцей белы; бляск шкляны або перламутравы. Цв. 2,5—3,5; шчыльн. 4300—4660 *кг/м*³. Трапляецца ў гідратэрмальных, асадкавых і россыпных радовішчах. Выкарыстоўваецца на выраб белай фарбы (літапон) і барыевых прэпаратаў, як напаўняльнік у папяровай і гумавай прамысл., на ўцяжаранне буравых растворaў і інш. Радовішчы ў СССР, ЗША, ФРГ, Вялікабрытаніі і інш.

БАРЫТОН (італьян. baritono ад грэч. barýs цяжкі + tónos тон), 1) мужчынскі голас, сярэдні паміж тэнарам і басам. Дыяпазон G—g¹. 2) Струнны смычковы муз. інструмент нізкага рэгістра. Меў 6—7 іграных і 7—20 (і больш) рэзанансавых струн. Быў пашыраны ў 18 ст. 3) Духавы мушткоўковы муз. інструмент. Выкарыстоўваецца ў духавых аркестрах.

БАРЫЧАВІЧЫ, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр Біжаравіцкага с/с і калгаса «Звязда». За 35 *км* на У ад Пінска, 215 *км* ад Брэста. 362 ж., двароў 110 (1970). Сепаратарны пункт, швейная і шавецкая майстэрні. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін.


БАРЫЧАЎ, вёска ў Бабуніцкім с/с Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Запаветы Ільіча». За 18 *км* на Пн ад Петрыкава, 210 *км* ад Гомеля, 10 *км* ад чыг. ст. Мулярaўка. 102 ж., двароў 32 (1970). Пач. школа, магазін. На брацкай магіле абеліск сав. воінам і аднавяскоўцам.

БАРЫЧНАЕ ПОЛЕ, размеркаванне атмасфернага ціску ў прасторы (поле атмасфернага ціску). У сярэднім у кожны момант часу Б. п. характарызуецца паверхнямі роўнага ціску — ізабарычнымі паверхнямі. Пры перасячэнні з паверхнямі ўзроўню яны ўтвараюць лініі роўнага ціску — ізабары.

Адлюстроўваецца Б. п. картамі ізабар на стандартных узроўнях (узр. мора, 1000 *м*, 3000 *м* і г. д.) ці картамі барычнай тапаграфіі, на іх нанесены т. зв. дынамічныя вышыні роўнай ізабарычнай паверхні над узр. мора або над узр. ізабар складаюцца паводле назіранняў метэаралаг. станцый для канкрэтных тэрмінаў (сінаптычныя карты) ці па сярэдніх значэннях ціску за месяц, сезон, год (кліматалагічныя карты). Гл. таксама *Барычныя сістэмы*. *В. М. Жукоўскі*. Мінск.

БАРЫЧНЫ ГРАДЫЁНТ, вектарная велічыня, якая характарызуе змену атмасфернага ціску ў прасторы. Вымяраецца велічынёй змены ціску на адзінку адлегласці $\frac{\Delta p}{\Delta n}$ у кірунку найбольшага змяншэння ціску (гл. *Градыент*). Мае гарызантальную (перпендыкулярную да ізабары ў гарыз. плоскасці) і вертыкальную кампаненты. Гарыз. Б. г. вызначаецца спадам ціску ў мілібарах на 1° дугі экватара (111 *км*). Ад яго велічыні залежыць скорасць ветру. Памяншэнне ціску на адзінку адлегласці па вертыкалі паз. вертыкальным Б. г. Часта карыстаюцца яго адваротнай велічынёй — барычнай ступенню (у метрах на мілібар).

БАРЫЧНЫЯ СІСТЭМЫ, вобласці павышанага і паніжанага ціску ў барычным полі атмасферы. Асн. тыпы — *цыклон* і *антыцыклон* — на сінаптычных картах акрэсліваюцца замкнёнымі ізабарамі. Ціск у цэнтры цыклону меншы, чым на перыферыі, у антыцыклоне наадварот. Ізабарычныя паверхні ў цыклоне ўвагнуты ўніз у выглядзе варонак, а ў антыцыклоне купалападобна выгнуты ўверх. Б. с. з незамкнёнымі ізабарамі — лагчына, грэбень, седлавіна і інш. Форма і памеры Б. с. пастаянна мяняюцца, бо цесна звязаны з пэўнымі сістэмамі паветраных плыняў, з размеркаваннем т-ры, воблачнасці, атм. ападкаў. Сярэдняя скорасць перамяшчэння Б. с. 30—40 *км/гадз*. Найменшае значэнне ціску паветра (886,8 *мб*) адзначана ў цыклоне на ўзр. м., найбольшае (1070 *мб*) у антыцыклоне. На Беларусі найменшы ціск 970 *мб*, найбольшы 1055 *мб*.



Барычныя сістэмы: *Ц* — цыклон, *А* — антыцыклон, *Г* — грэбень, *Л* — лагчына, *С* — седлавіна.

С. Л. Драгун. Мінск.

БАРЫЧЭЎСКІ Арцём Іванавіч [10(22).6.1890, в. Сернікі Пінскага пав. Мінскай губ.— 2.11.1969], Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. Да Кастр. рэв. лесаруб. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў. На франтах Айч. вайны з 1941; нам. камандзіра батальёна, маёр. Вызначыўся 24.6.1944 у час прарыву варожай абароны на ПнЗ ад Рагачова Гомельскай вобл. і 14.7.1944 каля Ваўкавыска Гродзенскай вобл. Штурмавая група, якою камандаваў Б., першая ўварвалася ў Ваўкавыск, захапіла цэнтр горада і ўтрымлівала яго да злучэння з батальёнам.



БАРЫЧЭЎСКІ (сапр. Тарнава-Барычэўскі) Іван Пятровіч (1810—1887), археолаг, этнограф, даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага. З сям'і свяшчэнніка. Аўтар многіх артыкулаў па гісторыі, этнаграфіі і археалогіі, надрукаваных у «Журнале министерства народного просвещения»:

«Камяні літоўскіх багінь» (1839), «Пра рускі летапіс у Літве, названы «Хронікай Быхаўца» (1838), «Урывак з літоўска-рускай гісторыі» (1845), «Даследаванне пра паходжанне, назву і мову літоўскага народа» (1847) і інш. Удзельнічаў у выданнях археаграфічнай камісіі. Сабраў і выдаў шмат мясцовых паданняў, легендаў і павер'яў.

Тв.: Повести и предания народов славянского племени, СПб., 1840; Народные славянские рассказы, СПб., 1844; Об издании «Актов, относящихся к истории Западной России», «Журнал Министерства народного просвещения», 1846, ч. 50, 1849, ч. 64, 1852, ч. 73; Известия о древних памятниках, находящихся в ведомстве Главного управления путей сообщения и публичных зданий, «Известия имп. археологического общества», 1861, т. 3, в. 4.

Літ.: Аляксеев Л. В. Масква.

БАРЫЧЭЎСКІ Яўген Іванавіч (17.12.1883, Мінск — 16.9.1934), беларускі савецкі літаратуразнавец. Праф. БДУ (1928). З сям'і пратарыуса. Пасля Мінскай гімназіі вучыўся ў Берлінскім (1903—04) і Маскоўскім (скончыў у 1910) ун-тах. У 1910—18 выкладаў рус. л-ру ў сярэдніх навуч. установах Масквы, у 1918—22 вучоны сакратар Галоўмузея РСФСР. У сак. 1922 пераехаў у Мінск. Працаваў у БДУ, Цэнтр. парт. школе, Ін-це л-ры і мовы АН БССР (1927—33). Даследаваў пытанні паэтыкі і эстэтыкі, творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Пушкіна, П. Беранжэ, І. В. Гётэ.

Тв.: Тэорыя санету, Мн., 1927; Паэтыка літаратурных жанраў, Мн., 1927.

БАРЫШАЎКА, вёска ў Жаліўскім с/с Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр саўгаса «Савецкая Беларусь». За 12 *км* на Пн ад Чавусаў, 60 *км* ад Магілёва, 17 *км* ад чыг. ст. Чавусы. 174 ж., двароў 48 (1970). За 4 *км* ад Б. цагельня. У вёсцы пач. школа, б-ка, дзіцячы сад, сталовая. У Айч. вайну спалена фашыстамі. Брацкая магіла 375 сав. воінаў.

БАРЭЙКА Аркадзь Аляксандравіч [14 (26).1.1898, в. Дуброўка Полацкага павета Віцебскай губ.— 14.12.1955], Герой Савецкага Саюза (1944), генерал-маёр (1941). З сялян. Чл. КПСС з 1928. У 1918 старшыня к-та сялянскай беднаты. З 1919 у Чырв. Арміі, змагаўся з дзянікінскай арміяй. Скончыў курсы чырв. камандзіраў (1920). З 1936 камандзір стралковага палка. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну камандаваў дывізіяй, потым корпусам у складзе Зах., Бранскага, Цэнтр. і 1-га Бел. франтоў. У вер. 1943 байцы корпуса, якім камандаваў Б., паспяхова фарсіравалі Дняпро каля Чарнігава і захапілі плацдарм на правым беразе.



БАРЭЙША Антон Сцяпанавіч (1858, хутар Любопаль Пінскага пав. Мінскай губ.— 1924), удзельнік рэвалюцыйнага руху 80-х г. 19 ст., парадаволец. Вучыўся ў Пінскім і Беластоцкім рэальных вуч., Пецярбургскім тэхнал. ін-це, дзе аблізіўся з І. Я. *Грынявіцкім*, Г. М. *Гельфман*, Р. П. *Ісаевым*. Вёў рэвалюц. прапаганду сярод рабочых Пецярбурга і сялян Пінскага пав. Працаваў у друкарнях «Рабочей газеты» і арг-цыі *«Народная воля»*, друкаваў і распаўсюджваў пракламацыі пра забойства Аляксандра II. 18.12.1881 арыштаваны і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. У сак. 1883 засуджаны на 15 гадоў катаргі з далейшым пажыццёвым пасяленнем у Сібіры.

Літ.: Жуковский-Жук. Антон Степанович Борейшо, «Каторга и ссылка», 1925, кн. 1(14); Процесс 17-ти народовольцев в 1883 году, «Былое», 1906, № 10. *Я. І. Карнейчык.* Мінск.

БАРЭЛЬЕФ (франц. bas-rélief літар. нізкі рэльеф), від скульптуры, у якім фігуры выступаюць над плоскасцю фону не больш



Барэльеф работы А. Бембеля. Каланіяльныя народы ўзнімаюцца на барацьбу. Дом урада БССР. 1932—34.

чым на палову свайго аб'ёму. На Беларусі вядомы Б. работы З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, С. Селіханава і інш.

БАРЭМСКІ ВЕК (ЯРУС) (ад назвы в. Барэм у Францыі), сярэдні век раннемелавой эпохі *мелавога перыяду* (трэці знізу ярус ніжнемелавога аддзела мелавой сістэмы). Вылучаны Г. Каканам у 1861. Адклады Б. я. пашыраны на тэр. Еўрап. ч. СССР, Крымска-Каўказскай вобл. і Капетдага. На Беларусі ёсць на У Прыпяцкай упадзіны і ў Жлобінскай седлавіне. Складзены з цёмна-шэрых глінаў магутнасцю да 10 *м* з праслоямі пяскоў і алеўрытаў.

БАРЭСКАЎ Георгій Канстанцінавіч [н. 7(20).4.1907, Омск], савецкі хімік. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1958). З 1958 дырэктар Ін-та каталізу Сібірскага адд-ня АН СССР. Герой Сац. Працы (1967). Даследаванні ў галіне хім. каталізу і звязаны з распрацоўкай актыўных прамысл. каталізатараў для многіх важных хім. працэсаў. Вынайшаў новы ванадыевы каталізатар (БАВ) для вытв. сернай к-ты, на ім з 1937 працуюць усе кантактавыя з-ды Сав. Саюза. Гал. рэдактар час. «Кинетика и катализ». Дзярж. прэміі СССР 1942 і 1953. Узнаг. 2 ордэнамі.




Тв.: Катализ в производстве серной кислоты, М.—Л., 1954.

Літ.: Георгий Константинович Боресков (К 60-летию со дня рождения), «Кинетика и катализ», 1967, т. 8, в. 2.

БАРЭЦКІЯ, наўгародская баярская сям'я, якая актыўна ўплывала на палітычнае жыццё Ноўгарада ў 15 ст. Марфа Б. (пасадніца, удава пасадніка Ісака Андрэевіча), узначальвала партыю наўгародскіх баяр, што імкнуліся да збліжэння з Вял. кн. Літоўскім і захавання незалежнасці Ноўгарада ад маскоўскіх вялікіх князёў. У 1470 сын Марфы Б., сцяпенны пасаднік Дзмітрый, удзельнічаў у перагаворах і заключэнні саюзу з вял. князем Казімірам IV. У 1471 маскоўскія войскі разбілі на р. Шалоні наўгародскае апалчэнне на чале з Дзмітрыем Б., які трапіў у палон і пакараны смерцю. Сын Марфы Б., Фёдар, захоплены ў 1476, саслан ў Мурам, там і памёр. Пасля далучэння Ноўгарада да Масквы (1478) Марфа Б. з унукам Васілём Фёдаравічам зняволена і выслана ў Маскву, потым пастрыжана ў манашкі, усл маёмасць Б. канфіскавана.

БАС (італьян. basso літар. нізкі), 1) нізкі мужчынскі голас. Дыяпазон D — e¹. 2) Муз. інструменты нізкага рэгістра (Б.-туба, кантрабас, *басэтля*). 3) Самы нізкі голас у шматгалосым муз. творы. 4) Б. лічбаваны, генерал-Б., спосаб натацыі ў выглядзе аднагалосай мелодыі баса і сістэмы лічбавых азначэнняў акордаў. Ужываўся ў 17—18 ст. для клавесінных, арганных, лютневых акампанементаў. Забяспечваў магчымасць імправізаваць на аснове зададзенай гарманічнай схемы.

БАСАЛЫГА Дзмітрый Мікалаевіч [парт. псеўд. Ігнат, Уральскі, Ігнатарскі; 15(27).11.1884, в. Варкавічы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 15.4.1969], прафесіян. рэвалюцыянер, дзеяч кінамастацтва. З сям'і фельчара. Чл. КПСС з 1904. Вучыўся ў Харкаўскім тэхнал. ін-це (1904—08). У рэв. 1905—07 кіраваў баявой дружынай у Харкаве. З 1906 на нелегальнай парт. рабоце ў Севастопалі, Пермі, Екацярынбургу. Дэлегат V (Лонданскага) з'езду РСДРП. У 1908 у Харкаўскай турме. З 1910 працаваў на кінафабрыцы А. Ханжанкова ў Маскве, адначасова вучыўся на юрыд. ф-це Маскоўскага ун-та, у школе-студыі МХАТ і вёў рэвалюц. дзейнасць сярод рабочых Прэсні і Мыцішчаў. Удзельнік Кастр. рэв. і грамадз. вайны. У 1920—21 заг. Цэнтр. ўпраўлення тэатраў Наркамасветы РСФСР, у 1923—26 старшыня праўлення акц. т-ва «Пралетарскае кіно». У 1924 па даручэнні ЦК РКП(б) зняў на кінастужку пахаванне У. І. Леніна. Рэжысёр і сцэнарыст кінафільмаў «Барацьба за ультыматум» (1923), «Чырвоны тыл» (1924), «З іскры полымя» і «Мусульманка» (абодва



1925, Залатыя медалі на Парыжскай выстаўцы) і інш. У 1938—41 працаваў у Траццякоўскай галерэі. З вер. 1941 у Чырв. Арміі. У 1944—45 выкладчык Вышэйшай дыпламат. школы пры МЗС СССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, медалямі.

Тв.: Незабываемые встречи, у кн.: Воспоминания о Владимире Ильиче Ленине, ч. 3, М., 1961.

Літ.: Пятый (Лондонский) съезд РСДРП. Протоколы, М., 1963; Нежный И. Былое перед глазами, М., 1965.

Т. Дз. Арлова, Г. К. Юхновіч. Мінск.

БАСАЛЫГА Канстанцін Мікалаевіч [парт. псеўд. Дальні, Іван; 18(30).5.1887, в. Варкавічы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 9.9.1963], прафесіян. рэвалюцыянер. Брат Дз. М. *Басалыгі.* Чл. КПСС з 1905. У рэв. 1905—07 чл. ваенна-баявога штаба ў Харкаве, Севастопальскага к-та РСДРП і рэдакцыі яго органа — газ. «Салдат». Вёў парт. работу ў Харкаве, Адэсе, Екацярынадары, Севастопалі. Дэлегат V (Лонданскага) з'езду РСДРП ад бальшавікоў Урала. Даставіў У. І. Леніну мандат дэлегата ад бальшавікоў Усолля. У 1915 сасланы ў Омск. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі. Пасля рэвалюцыі на гасп. рабоце ў Омску, Краснадары, Севастопалі, Стаўраполлі. У Вял. Айч. вайну ў Севастопальскім нар. апалчэнні. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.



Тв.: Мандат тов. Ленину, «Пролетарская революция», 1922, № 3, с. 249—251.

Г. К. Юхновіч. Мінск.

БАСАЎ Канстанцін Іванавіч [25.10(7.11). 1912, в. Новыя Бурасы Саратаўскай губ.— 25.5.1961], беларускі савецкі архітэктар. У 1931—37 вучыўся ў Ленінградскім ін-це інжынераў камунальнай гасп. У 1941—45 працаваў у Хабараўску. З 1953 у Мінску. Аўтар праектаў забудовы Партызанскага праспекта і жылога пасёлка аўтазавода ў Мінску (1953—54), цэнтр. часткі Оршы (1954—55), Запёманскага раёна і мікрараёна на вул. Горкага ў Гродне (1955—56). Адзін з аўтараў ген. плана Гродна (1960).


БАСАЎ Мікалай Генадзевіч (н. 14.12.1922, г. Усмань Варонежскай губ.), савецкі фізік. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1962). Чл. КПСС з 1950. Герой Сац. Працы (1969). З 1953 працуе ў Фізічным ін-це АН СССР. З 1958 нам. дырэктара, з 1962 заг. лабараторыі квантавай радыёфізікі гэтага ін-та. Асн. працы ў галіне квантавай электронікі. У 1954—55 з А. М. *Прохаравым* стварыў першы малекулярны генератар (мазер). Ленін-



ская прэмія 1959. Нобелеўская прэмія 1964. Узнаг. ордэнам Леніна.

Тв.: (разам з А. М. Прохаравым) Молекулярный генератор и усилитель, «Успехи физических наук», 1955, т. 57, в. 3; Молекулярный генератор на пучке молекул аммиака, «Приборы и техника эксперимента», 1957, № 1; (разам з А. М. Прохаравым) Квантовая радиофизика, «Вестник АН СССР», 1960, № 4.

БАСЕЙН (франц. bassin), 1) плошча сушы, з якой паверхневыя і падземныя воды сцякаюць у раку (рачны Б.), возера ці мора (Б. возера, мора). Самы вял. ў свеце рачны Б. мае Амазонка (больш за 7 млн. *км*²); на Беларусі — Дняпро з Прыпяццю (118 тыс. *км*²). 2) Зона залягання пэўных каштоўных выкапняў (напр., Данецкі кам.-вуг. Б.). 3) Б. пырскальны — адкрытае збудаванне для ахалоджвання вады, якая цыркулюе ў замкнёнай (зваротнай) сістэме водазабеспячэння прамысл. прадпрыемстваў і адводзіць цяпло з апаратаў, рухавікоў і інш. Глыб. Б. 1—1,8 *м*, над ім распырскваецца гарачая вада і ахалоджваецца паветрам, пасля чаго выкарыстоўваецца зноў. 4) Б. напорны — гідратэхн. збудаванне для размеркавання вады паміж турбіннымі вадаводамі, ачысткі патоку ад смецця, шарашу і лёду, для скіду лішкаў вады. 5) Б. доследны прызначаны для выпрабаванняў мадэляў караблёў і гідратэхн. збудаванняў. Першы Б. доследны пабудаваны ў Расіі ў 1889 у Пецярбурзе. 6) Б. веславальны — памяшканне для заняткаў спарт. веславаннем. Пасярэдзіне веславальнай залы робіцца мураваны памост. На памосце, шырыня якога роўная шырыні лодкі, мацуюцца рухомыя банкі (месца для сядзення) і выносныя ўключыны для дзвюхлопасцевага і парнага веславання. Па баках памоста знаходзяцца каналы з вадой; іх шыр. да 2,5 *м*, глыб. да 60 *см*. Каб наблізіць умовы веславання да прыродных, робяць цыркуляцыю вады з дапамогай помпаў. 7) Б. плавальны — збудаванне для вучэбна-трэніровачных заняткаў і спаборніцтваў па плаванні, скачках у ваду і водным пола. Бываюць закрытыя і адкрытыя. Памер (*м*) 25×15 ці 50×(20—25). Глыб. ад 1 да 4,5 *м* (у месцах скачкоў у ваду). Вада падаграецца, пастаянна цыркулюе, ачышчаецца і абеззаражваецца хлараваннем. Мінскі Б. з трыма ваннамі — адзін з найлепшых у СССР.



Плавальны басейн у Мінску.

БАСІН Мэер Вэлькавіч (1890, Чэрыкаў Магілёўскай губ.— 20.9.1918), бакінскі камісар. Чл. Камуніст. партыі з 1912. З сям'і вадавоза. Скончыўшы рамеснае вуч. ў Магілёве, з 1911 працаваў слесарам у Баку. Удзельнічаў у прафсаюзным руху, у арганізацыі бакінскай стачкі 1914, за што арыштаваны. З канца 1914 чл. праўлення прафсаюза рабочых нафтавай прамысл. ў Баку. З вясны 1917 дэп. Бакінскага Савета, з 8.7. 1917 чл. Бакінскага гаркома РСДРП(б). Адзін з кіраўнікоў усеагульнай стачкі бакінскага пралетарыяту ў вер. 1917. З ліст. 1917 сакратар прэзідыума выканкома і рабочай секцыі Бакінскага Савета. З крас. 1918 заг. рабочай секцыі Бакінскага савета нар. гасп. Забіты англ. інтэрвентамі і эсэрамі. У Баку і ў Чэрыкаве ёсць вуліцы, названыя імем Б.; у Магілёве на будынку рамеснага вуч. ўстаноўлена мемарыяльная дошка. *М. Ф. Мельнікаў.*



БАСКАК (цюрк.), чыноўнік мангольскага хана, які вёў улік насельніцтва і збіраў даніну на захопленай тэрыторыі. На Русі Б. былі з сярэдзіны 13 ст. Пасля шэрагу пар. паўстанняў супраць жорсткасці Б. у 14 ст. збор даніны ханы даручылі рус. князям.

БАСКАКАЎ Аляксей Андрэевіч (11.2.1923, в. Саннікава Корчаўскага пав. Цвярской губ.— 19.5.1943), удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Канд. у чл. КПСС. Напярэдадні вайны працаваў у раённай пракуратуры Калінінскай вобл. З чэрв. 1941 камандзір камсамольска-маладзёжнага батальёна абарончага будаўніцтва. У кастр. 1941 арганізаваў партыз. атрад. З 8.6.1942 камандзір *партызанскай брыгады дыверсійнай Беларускай* імя У. І. Леніна, якая дзейнічала ў Віцебскай, потым у Вілейскай абл. Загінуў у баі. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.

БАСКЕТБОЛ (англ. basket кошык + ball мяч), камандная спартыўная гульня. Узнікла ў 1891, калі настаўнік Спрынгфілдскага каледжа (ЗША) д-р Дж. Нейсміт распрацаваў правілы гульні. Гуляюць 2 каманды па 5 чал. на прамавугольнай пляцоўцы (*м*) 26×14, па каротких баках якой на шчытах прымацаваны кольцы на выш. 2,5—3,05 *м*. Мэта гульні: кожная каманда павінна як мага больш разоў закінуць мяч у кольца праціўніка і перашкаджаць нападаню мяча

ў кольца сваёй каманды. У Расіі Б. пачаў развівацца ў 1906. У 1935 Міжнар. алімпійскі к-т (МАК) прызнаў Б. алімп. відам спорту. На Беларусі першыя гульні адбыліся ў Віцебску ў 1921. З 1924 наладжваюцца чэмпіянаты БССР. Бел. баскетбалісты ўдзельнічаюць у пяршынствах СССР і спартакіядах народаў СССР, у міжнар. спаборніцтвах. На Беларусі (1970) займаюцца Б. каля 180 тыс. чал., з іх 38 майстроў спорту і каля 30 тыс. разраднікаў. Існуе федэрацыя Б. БССР.

БАСКУНЧАК, салёнае самасадачнае возера ў Астраханскай вобл., паблізу гары Вялікае Багдо. Пл. 105 *км*². Узровень возера на 21 *м* ніжэй за ўзр. акіяна. Узнікненне катлавіны звязана з саляной тэктонікай. Б. жывіцца многімі салянымі крыніцамі. Буйная механізаваная здабыча солі.

БАСМАНАЎ Аляксей Данілавіч (г. н. невяд.— п. 1570), рускі дзяржаўны і ваенны дзеяч. Сын Д. А. Пляшчэева, прызванага Басманам, які загінуў у палоне ў Вял. кн. Літоўскім. З 1552 акольнічы, з 1555 баярын. Вызначыўся ў 1552 пры ўзяцці Казані і ў бітве пры Судбішчах (1555), дзе з 6-тысячным атрадам стрымаў войскі крымскага хана Дэўлет-Гірэя (60 тыс.). У Лівонскую вайну кіраваў узяццем Нарвы (1558), удзельнічаў у асадзе і ўзяцці Полацка (1563). У 1564 узначальваў абарону Разані ад войск крымскага хана. Адзін з ініцыятараў апрычніны, даверапая асоба цара Івана IV. У 1570 абвінавачаны ў сувязях з наўгародцамі, якія арыентаваліся на Вял. кн. Літ., і ў намеры пасадзіць на трон стрыечнага брата Івана IV — Уладзіміра Старыцкага. Паводле адных звестак пакараны смерцю з сынам Фёдарам, паводле інш.— памёр у Белавозеры.

БАСМАЦТВА (ад цюрк. басмак — нападаць, палятаць), узброены нацыяналістычны рух у Сярэдняй Азіі (Туркестане, Бухары, Харэзме) у 1917—26, які набыў характар адкрытага палітычнага бандытызму. Арганізавана і ўзначальвалася байска-феад. вярхамі, рэакц. мусульм. духавенствам, падтрымліваўся белагвардзейцамі і іншаземнымі імперыялістамі.

Мэта Б.— адарваць народы Сярэд. Азіі ад Сав. Расіі, скінуць Сав. ўладу, стварыць бурж.-нацыяналіст. дзяржаву, аднавіць ханскую ўладу і байска-феад. парадкі. Басмачы нападалі на сав. ўстановы, вайск. часці, рабавалі мірнае насельніцтва, разбуралі пар. гаспадарку. Большасць насельніцтва не падтрымлівала Б. У сак. 1920 Чырв. Армія на чале з М. В. Фрунзе разбіла асн. сілы басмачоў. У час сав.-польскай вайны Б. зноў актывізаваліся ў Фергане. У кастр. 1921 былы ваен. міністр Турцыі Энвер-паша аб'яднаў рэшткі разбітых басмацкіх атрадаў у армію, якая да вясны 1922 захапіла значную ч. Бухарскай Нар. Сав. Рэспублікі. На ліквідацыю Б. накіраваны вайск. часці на чале з галоўнакамандуючым узброеных сіл РСФСР С. С. Каменевым і чл. ЦК РКП(б) Р. К. Арджанікідзе. Чырв. Арміі памагалі мясцовыя атрады дэкхан (сялян), міліцыі, нац. фарміраванні. У 1922 банды Энвер-пашы ліквідаваны, іх рэшткі збеглі ў Афганістан і Іран. З-за мяжы басмацкія атрады рабілі налёты на сав. тэрыторыю да 1930. Поўнай ліквідацыі Б. спрыяла ажыццяўленне ленінскай нац. палітыкі ў Сярэд. Азіі.

Літ.: История гражданской войны в СССР, т. 3—5, М., 1958—60; История гражданской войны в Узбекистане, т. 1, Ташкент, 1964.

БАСНІЙСКІЯ КРЫЗІСЫ 1875—78 і 1908—09, міжнародныя канфлікты з-за супярэчлівых інтарэсаў еўрап. дзяржаў на Балканах.

Першы, т. зв. Усходні крызіс, наблізіла антытурэцкае выступленне *Герцагавінска-Баснійскае паўстанне 1875—78*. Сербія і Чарнагорыя, заціснутыя ў аб'яднанні паўд. славян, падтрымалі паўстанцаў і абвясцілі 30.6.1876 Турцыі вайну. Урад Аўстра-Венгрыі імкнуўся не даць магчымасці стварыць паблізу сваіх граніц паўд.-слав. дзяржаву, якая арыентавалася б на Расію. Апошняя меркавала з дапамогай калект. захадаў еўрап. краін прымусіць Турцыю даць Босніі і Герцагавіне аўтаномію. Пасля таго як тур. ўрад адмовіўся выканаць патрабаванні Канстанцінопальскай канферэнцыі паслоў 1876—77 і Лонданскага пратакола 1877 (аўтаномія Босніі і Герцагавіны, расшырэнне тэр. Сербіі і Чарнагорыі), Расія абвясціла Турцыі вайну. Паводле Сан-Стэфанскага мірнага дагавору 1878 Боснія і Герцагавіна атрымалі аўтаномію. Але неўзабаве ў Берліне быў падпісаны прадыктаваны зах. дзяржавамі трактат, паводле якога аўстра-венг. войскі акупавалі Боснію і Герцагавіну. 7.10.1908 Аўстра-Венгрыя анексіравала іх тэр., што выклікала новы крызіс. Турцыя заявіла пратэст супраць анексіі, але за кампенсацыю ў 2,5 млн. ф. ст. пагадзілася з ёю. Сербія пачала рыхтавацца да вайны, папрасіла дапамогі ў вялікіх дзяржаў, перш-наперш у Расіі. 21.3.1909 Германія ультыматыўна прапанавала Расіі прызнаць анексію, дала зразумець, што ў адваротным выпадку Аўстра-Венгрыя нападзе на Сербію. Пасля пяцідачы ў руска-яп. вайне 1904—05 царскі ўрад пазбягаў новых ваен. канфліктаў, і калі Англія і Францыя адмовіліся падтрымаць яго, мусіў прыняць ультыматум. 31.3.1909 анексію прызнала Сербія. Баснійскі крызіс 1908—09 паглыбіў супярэчнасці паміж *Антантай* і *Траістым саюзам*, спрыяў развязванню 1-й сусв. вайны.

Публ.: Ключников Ю. и Сабанин А. Международная политика новейшего времени в договорах, нотах и декларациях, ч. 1, М., 1925.
Б. І. Загорскі. Мінск.

БАСПОРСКАЯ ДЗЯРЖАВА (Баспор), рабаўладальніцкая дзяржава ў Паўн. Прычарнамор'і. Узнікла на Керчанскім і Таманскім п-вах у 480 да н. э. ў выніку аб'яднання грэч. гарадоў-калоній (полісаў): Пантыкапея, Мірмекія, Німфея, Фанагорыі, Гаргіпіі, Кепаў і інш. Сталіца — Пантыкапей (сучасная Керч).

Найбольшага росквіту Б. дз. дасягнула ў 4 ст. да н. э. У яе ўваходзілі Усх. Крым, Ніжняе Прыкубанне, Усх. Прыазоўе. Вывозіла ў Грэцыю і М. Азію рабоў, збожжа, рыбу, скуры; увозіла



аліўкавы алей, віно, зброю, тканіны, кераміку, ювелірныя і інш. вырабы, частку іх з прадуктамі ўласнай вытворчасці прадавала *скіфам* і *сарматам*. Вярхоўная ўлада належала архантам (царам). У 480—438 да н. э. дзяржавай кіравала дынастыя Археанактыдаў, яе змяніла дынастыя Спартакідаў, якая царавала больш за 300 гадоў. У 2-й пал. 2 ст. да н. э. ў Б. дз. абвастрыліся сацыяльна-эканам. супярэчнасці, узнікла пагроза захопу краіны скіфамі. Гэта прымусіла апошняга цара з дынастыі Спартакідаў, Перысада V, перадаць уладу больш магутнаму пантыйскаму цару Мітрыдату VI Еўпатару. У час перадачы ўлады (107 да н. э.) у Баспоры пануралі рабы і залежнае насельніцтва на чале з Саўмакам. Яны захапілі ўладу і забілі Перысада V. Паўстанне жорстка задушыў пантыйскі палкаводзец Дыяфант. Мітрыдат VI імкнуўся ператварыць Б. дз. ў базу для наступлення на Рым. Ён аблажыў насельніцтва цяжкімі падаткамі, што выклікала ў 63 новае паўстанне, у час яго Мітрыдат VI скончыў самагубствам. З гэтага часу Б. дз. палітычна залежала ад Рыма, але яму не ўдалося ператварыць Баспор у сваю правінцыю. У 1—2 ст. Б. дз. перажыла перыяд новага ўздыму гасп. і гандлю. Узніклі новыя гарады-крэпасці (Ілурат і інш.). Цар Саўрамат II завяваў і ўключыў у Б. дз. крымскіх скіфаў і таўраў. У выніку значнага прытоку ў гарады сармацкага насельніцтва культура набывала ўсё больш акрэслены скіфа-сармацкі характар. У сярэдзіне 3 ст. на Б. дз. рабілі напады готы, бораны і інш. Аслабленая сац. супярэчнасцямі ў 70-я г. 4 ст. В. дз. не вытрымала націску гунаў і перастала існаваць.

Археал. вывучэнне Баспора пачалося з 19 ст. Раскопкі вялі П. Дзюбрукс, І. А. Стамкоўскі, А. Б. Ашык, Д. В. Карэйша, А. Е. Люцэнка, В. В. Шкорпіл і інш. Планамерныя археал. даследаванні пачаліся ў сав. час (В. Ф. Гайдукевіч, У. Д. Блавацкі, М. М. Кабыліна і інш.). Выяўлены помнікі дойлідства (пахавальні з уступамі), Залаты, Царскі, Мелек-Чэсменскі курганы, зернясховішчы, рэшткі рыбазасольных і вінаробных ваннаў, ганчарныя і ювелірныя вырабы, скарбы з манет, размаляваныя скляпы з ваеннымі, культавымі і бытавымі сцэнамі, партрэтныя скульптуры. Сусветна вядомыя маст. вырабы, у т. л. Кульобская ваза з электрону (сплаў золата і серабра), на якой паказаны сцэны з жыцця скіфаў. Найлепшыя калекцыі баспорскіх старажытнасцей зберагаюцца ў Эрмітажы, Керчанскім гістар. і Дзярж. гістарычным музеях.

Літ.: Гайдукевич В. Ф. Боспорское царство, М.—Л., 1949; Каллистов Д. П. Очерки по истории Северного Причерноморья античной эпохи, Л., 1949; Жебелев С. А. Северное Причерноморье, М.—Л., 1953. *В. І. Гарамыкіна.* Мінск.

БАСТУНЫ, вёска ў Пагародзенскім с/с Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр саўгаса «Бастуны», чыг. ст. За 9 *км* на Пд ад Воранава, 125 *км* ад Гродна, 1 *км* ад скрыжавання аўтамаб. дарог Ліда — Вільнюс і Радунь — Іўе. 619 ж., двароў 171 (1970). Пякарня, адда. раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, сталовая, 4 магазіны.

БАСТЫЛІЯ (Bastille), крэпасць і турма ў Парыжы ў 14—18 ст. Пабудавана ў 1382. З 2-й пал. 16 ст. турма для паліт. зняволеных. Сімвал абсалютызму. 14.7.1789, у пачатку франц. бурж. рэвалюцыі, народ захапіў Б. Праз год яна была разбурана. Дзень узяцця Б.— нац. свята Францыі.

Літ.: Ахшарумов С. Д. История Бастилии, СПб., 1893; Люблинская А. Д. Бастилия и ее архив, у кн.: Французский ежегодник. 1958, М., 1959.

БАСТЫНЕЦ Міхаіл Сцяпанавіч (1896, Пінск — 27.10.1954), удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны. З рабочых. Чл. КПСС з 1917. З 1915 у царскай арміі; слесар аўтамайстэрняў у Гомелі, потым у Мінску. Па заданні Палескага к-та РСДРП(б) арганізоўваў бальшавіцкія ячэйкі ў часцях Гомельскага гарнізона і ў мінскіх аўтамайстэрнях. На салдацкіх і рабочых мітынгах выступаў супраць Часовага ўрада, за гэта арыштаваны. У 1918 чл. Палескага падпольнага к-та РКП(б), чл. Гомельскага падпольнага ВРК і нач. штаба партыз. атрадаў. Стварaў партыз. атрады, аднаўляў партыйныя арг-цыі на прадпр. Гомеля і ў вёсках Палесся; удзельнічаў у распрацоўцы плана вызвалення Гомеля, кіраваў забастоўкай і паўстаннем рабочых горада (18.12.1918) супраць акупантаў. З 1919 у Чырв. Арміі. На Зах. фронце змагаўся з белапалякамі ў складзе Гомельскага пралетарскага батальёна. З 1921 на парт. рабоце. Скончыў курсы павятовых парт. работнікаў пры ЦК ВКП(б) (1928) і Маскоўскі электрамеханічны ін-т інжынераў траспарту (1936). Працаваў у Мін-ве электрастанцый СССР. Удзельнік Айч. вайны.

М. І. Гатоўкін, І. А. Смыкоўскі. Гомель.

БАСТЫНЬ, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях Леніна», чыг. прыпынак на лініі Лунінец—Баранавічы. За 18 *км* на Пн ад Лунінца, 260 *км* ад Брэста, 4 *км* ад чыг. ст. Дзятлавічы, каля шашы Лунінец — Ганцавічы (1 *км*). 2336 ж., двароў 706 (1970). Пільня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэд. школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, вет. ўчастак, адда. сувязі, 3 магазіны. У час бурж. Польшчы ў вёсцы дзейнічала падпольная ячэйка КПЗБ. У Айч. вайну нямецкія фашысты спалілі вёску, загубілі 89 яе жыхароў. Помнік сав. воінам, 2 помнікі жыхарам Б.

БАСТЫЯ (Bastiat) Фрэдэрык (19.6.1801—24.12.1850), французскі буржуазны эканаміст, прадстаўнік эканам. лібералізму 1-й пал. 19 ст., прапаведнік тэорыі *«гармоніі інтарэсаў»*. Працы: «Эканамічныя сафізмы» (1846), «Эканамічныя гармоніі» (1849). Выступаў супраць сацыялістычнага вучэння, абараняў капіталізм як «натуральную» арганізацыю грамадства: разглядаў яго як абмен паслугамі, а вартасць як адносіны абменных паслуг, сцвярджаў, што доля рабочага класа ў нац. даходзе павышаецца. К. Маркс у працы «Кэры і Бастыя» і інш. творах крытыкаваў погляды Б.

БАСУЛАЕЎ Анатоль Фядотавіч [2(15).6.1904, Керч — 18.4.1964], рускі савецкі мастак тэатра і кіно. Засл. дзеяч маст. РСФСР (1956). Працаваць у т-ры пачаў у 1925 (Харкаў), з 1929 афармляў спектаклі ў т-рах Масквы і Ленінграда. Адна з лепшых работ «Дачнікі» М. Горкага ў Вял. драм. т-ры імя М. Горкага, 1939 (Ленінград). З 1951 гал. мастак Ленінградскага т-ра драмы імя Пушкіна («Антымістыч-



Батальны жанр I. 1. Бітва на Нямізе. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу 13 ст. 2. Леанарда да Вінчы. Бітва пры Ангіяры. 1503—05. Гравюра Ж. Эдэлінка са старой копіі. 3. В. І. Сурыкаў. Пакарэнне Сібіры Ермаком. 1895. 4. В. В. Верашчагін. Смяротна паранены. 1873. 5. М. Б. Грэкаў. Трубачы Першай коннай арміі. 1934.



1



2



3



4



5

Батальны жанр II. 1. Я. А. Зайцаў. Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе. 1950. 2. У. П. Сухаверхаў. За родную Беларусь. 1948. 3. А. Д. Шыбнёў. Палонных вядуць. 1947. 4. М. А. Савіцкі. Партызаны. 1964. 5. А. К. Глебаў. Партызаны Беларусі. Гарэльеф абеліска-помніка воінам Савецкай Арміі і партызанам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, на пл. Перамогі ў Мінску. 1954.

ная трагедыя» У. Вішнеўскага, 1955, і інш.). У 1934—37 афарміў у БДТ-2 (т-р імя Я. Коласа) 6 спектакляў, у т. л. «Вайна — вайне» і «У пушчах Палесся» Я. Коласа (1937).

Літ.: Анатолий Федотович Босулаев. Каталог выставки, Л., 1967; Мичковский А. Анатолий Босулаев, у зб.: Театр и жизнь, Л.— М., 1957.

БАСУТАЛЕНД (Basutoland), былы пратэктарат Вялікабрытаніі. З 4.10.1966 незалежная дзяржава *Лесота*.

БАСФОР (Bósporos), праліў, які злучае Чорнае і Мармуровае моры. Даўж. каля 30 *км*, шыр. ад 750 *м* да 3,7 *км*. Берагі высокія, стромкія. Найменшая глыб. на фарватэры 33 *м*. Цячэнні: паверхневае з Пн на Пд, менш салёнае (17—18‰); глыбіннае з Пд на Пн, больш салёнае (37—38‰). Каля выхаду з Б. ў Мармуровае м. г. Стамбул.

БАСЦЕНАВІЧЫ, вёска ў Капачоўскім с/с Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Кашанка. Цэнтр калгаса імя Энгельса. За 22 *км* на З ад Мсціслава, 92 *км* ад Магілёва, 14 *км* ад чыг. ст. Ходасы. 376 ж., двароў 133 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БАСЭТЛЯ, беларускі народны струнны смычковы музычны інструмент ніжкага рэгістра. Блізкі да віяланчэлі. Мае 4 струны, на грыф часта наносяць ладавыя адзнакі. Смык просты, кароткі. Б. выкарыстоўваецца пераважна ў ансамблях, асабліва ў *трайстай музыцы* (2 скрыпкі і Б. або скрыпка, бубен і Б.). У сучаснай выканальніцкай практыцы ўжываецца рэдка.



БАСЯ, рака, правы прыток р. Проні (бас. Сажа). Даўж. 104 *км*. Пачынаецца ў зах. частцы Смаленскага ўзв., цячэ па Аршанска-Магілёўскай раўніне ў Горацкім, Шклоўскім і Чавускім р-нах Магілёўскай вобл. Рэльеф вадазбору (955 *км*²) слабаўзгорысты, перасечаны ярамі і далінамі. Гал. прытокі злева — Паўна, Галубіна, справа — Лімна, Аўчоса, Лешня. Жыўленне мяшанае, снега-дажджавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 5,7 *м*³/*сек*.

БАСЯНКОЎ Пётр Харытонавіч [н. 12(25).11.1908, в. Вылева Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. З 1922 працаваў слесарам у Гомелі. У 1930—32 у Чырв. Арміі. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну змагаўся пад Сталінградам, на Курскай дузе, на Беларусі, у Прыбалтыцы, Германіі. Вызначыўся ў баі каля г. Добеле Латв. ССР у вер. 1944. У час танкавай атакі фашыстаў экіпаж Т-34, у якім быў і Б., знішчыў 3 варожыя машыны і самаходную гармату. У нярoўным баі ад варожага снарада танк загарэўся; з экіпажа жывы астаўся толькі Б. Ён не спыняў бою, і атака фашыстаў была адбіта. Жыве ў Касцюкоўцы Гомельскай вобл.



БАТАВІЯ, былая галандская назва *Джакарты*.

БАТАЕВА, вёска ў Батаеўскім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Войская. Цэнтр калгаса «Прагрэс». За 28 *км* на ПдЗ ад Хоцімска, 200 *км* ад Магілёва, 14 *км* ад чыг. паўстанка Журбін. 341 ж., двароў 98 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, швейная майстэрня, магазін, 2 помнікі-абеліскі сав. воінам і партызанам.

БАТАЛАЎ Рыгор Міхайлавіч [н. 15(28).1.1915, Віцебск], савецкі ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант (1965). Герой Сав. Саюза (1943). З рабочых. Чл. КПСС з 1939. З 1931 слесар у аўтамайстэрнях Віцебска. У Чырв. Арміі з 1934. Скончыў Мінскае ваен.-пях. вучылішча (1937), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1959). У пач. Айч. вайны камандзір кулямётнай роты Мінскага вуч. на Зах. фронце. З ліп. 1942 на Паўд.-Зах., Сталінградскім, Данскім, Варонежскім, Сцяпным і 2-м Укр. франтах: нач. аператыўнага аддзялення штаба дывізіі, камандзір палка, нам. камандзіра дывізіі. Удзельнік баёў на Доне, пад Сталінградам, Белгарадам, Харкавам, пры фарсіраванні Дняпра, вызваленні Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі. Служыць у Сав. Арміі. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



БАТАЛАЎ Фёдар Аляксеевіч [29.8(11.9).1900, Казань — жн. 1941], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1941). З рабочых. Чл. КПСС з 1927. У грамадз. вайну змагаўся з чэхаславацкім мяцежным корпусам пад Самарай і Сімбірскам, з дзянікінцамі пад Царыцынам, з басмачамі ў Сярэд. Азіі. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. Вызначыўся ў пач. Айч. вайны каля Жлобіна і Рагачова Гомельскай вобл. Батальён, якім камандаваў Б., 15.7.1941 аламаў упартае супраціўленне ворага, контратакаваў яго і захапіў Паўн. і Паўд. дэпо ст. Жлобін; 17.7.1941 выбіў гітлераўцаў з в. Заграддзе, 18.7.1941 з в. Прыдарожжа і Заводная. Загінуў пры выхадзе з акружэння.

БАТАЛІТ, вялікі масіў глыбінных вывергнутых парод. Гл. *Заляганне горных парод*.

БАТАЛЬЁН (ад італьян. battaglia атрад), тактычнае падраздзяленне ў мотастралковых,

танкавых, паветрадэсантных, інжынерных, аўтамабільных і інш. войсках. Звычайна складаецца з некалькіх рот і спец. падраздзяленняў. Уваходзіць у склад палка і можа быць самастойнай вайсковай часцю (асобны Б.). Агульнавайсковае падраздзяленне — мотастралковы Б. складаецца з некалькіх мотастралковых рот і падраздзяленняў інш. родаў войск, мае высокую манеўранасць, устойлівы ад зброі масавага паражэння. У рус. арміі падзел палка на Б. ўвёў Пётр I.

БАТА́ЛЬНЫ ЖАНР (ад франц. bataille бітва), жанр выяўленчага мастацтва, прысвечаны падзеям вайны (бітвы, сцэны з жыцця і быту арміі); раздзел *гістарычнага жанру*. У мастацтве Асіры, Ст. Егіпта, антычным мастацтве батальныя сцэны ўслаўлялі доблесць правадыроў, герояў. У сярэд. вякі сустракаліся ў мініяцюры як ілюстрацыя да хронік. Асобнае месца займае Б. ж. у мастацтве эпохі Адраджэння (найб. у жывапісе). Перадае напружанасць барацьбы, актыўнае дзеянне мас (Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Тыцыян). З 17 ст. азначаецца некалькі кірункаў Б. ж.: дакументальна-хранікальны, які фіксуе эпізоды бітваў (Ф. Воўверман); умоўна-алегарычны, што ўслаўляе палкаводцаў (Ш. Лебрэн); рэалістычны (Д. Веласкес). Найб. пашыраецца Б. ж. у 19 ст. Побач з афіцыйна-пампезным (А. Ж. Гро) узнікае дэмакратычны, прагрэс. кірунак (Ф. Гоя, Т. Жэрыко), праякнуты духам рэвалюц. рамантыкі (Э. Дэлакруа). У творах В. ж. часта гучыць пратэст супраць войнаў (Ж. Кало, К. Кольвіц), асабліва пасля вайны 1914—18 (О. Дыкс, Э. Барлах). У сучасным прагрэс. мастацтве Б. ж. прысвечаны барацьбе з фашызмам (Р. Гутуза, Дж. Манцу). У рус. мастацтве сцэны бітваў вядомыя яшчэ з сярэдневякоўя, але В. ж. пачаў фарміравацца ў пятроўскую эпоху (гравюры А. Зубава, мазаіка М. Ламаносава «Палтаўская баталія»). У 19 ст. падзеі вайны з Напалеонам адлюстраваліся ў барэльефах Ф. Талстога, сатырычных лістах І. Церабянёва, А. Венецыянава; праўдзівыя «Казацкія сцэны» пакінуў А. Арлоўскі, замалёўкі з армейскага жыцця — П. Фядотаў. Карціны марскіх бітваў пісалі І. Айвазоўскі, А. Багалюбаў. Вяршыня рускага В. ж.— творчасць В. Верашчагіна і В. Сурыкава.

Сав. Б. ж. паказвае несправядлівасць агрэсіўных і гуманістычны характар вызвалення войнаў, гераізм народа, духоўнае хараство сав. воіна (творы А. Вярэйскага, С. Герасімава, М. Грэкава, А. Дайнекі, М. Жукава, А. Пахомава, К. Пятрова-Водкіна, Л. Сайферціса, П. Сакалова-Скаля, М. Самокіша, Ф. Фівейскага, Дз. Шмарынава, П. Шухміна і інш.). Асобнае месца ў сав. Б. ж. займае мастацтва панарамы і дыярамы. У Сав. Беларусі творы Б. ж. з'явіліся ў 20-я г. («Барыкады. З падзей 1905 г. ў Маскве», «Партызаны» В. Волкава і графічны цыкл С. Юдовіна «Грамадзянская вайна»). Перад Вял. Айч. вайной сталі вядомыя творы жывапісцаў І. Ахрэмчыка, Я. Зайцава, Б. Каплана, Л. Лейтмана, М. Манасзона, З. Мірынгофа, Я. Ціхановіча, скульптараў А. Арлова, А. Бембеля, А. Глебава, А. Жорава і інш. Сярод твораў Б. ж. бел. мастакоў перыяду Айч. вайны — замалёўкі з франтавога жыцця (І. Давідовіч), партыз. быту (С. Рамапаў, П. Гаўрыленка і інш.). Пасля вайны тэмы партыз. барацьбы, абароны Радзімы, гераізму сав. людзей, перамогі знайшлі адлюстраванне ў карцінах Ахрэмчыка («Абаронцы Брэсцкай крэпасці»), Зайцава («Пахаванне Героя Савецкага Саюза партызана К. Заслонава», «Парад партызанаў у 1944 у Мінску», «Абарона Брэсцкай крэпасці»), У. Сухаверхава («За родную Беларусь»), А. Шыбнёва («Палонных вядуць»), Волкава («Мінск 3 ліпеня 1944 г.»), Я. Ціхановіча («Партызаны ў разведцы»), І. Стасевіча («У беларускіх балотах»), Н. Воранава («Рэйд Каўпака»), М. Савіцкага («Партызаны», «Партызанская мадонна») і інш.; у рэльефах мінскага абеліска-помніка воінам Сав. Арміі і партызанам, што загінулі ў Айч. вайну (скульптары З. Азгур, Бембель, Глебаў, С. Селіханаў), і інш. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Садовень В. В. Русские художники-баталисты XVIII—XIX веков, М., 1955; Бродский В. Советская батальная живопись, М.—Л., 1950; Орлова М. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960.

А. І. Капцюг. Масква; *Э. В. Арава.* Мінск.

БАТАНІКА (ад грэч. botanē трава, зелянціна), комплекс навук пра расліны. Вывучае іх вонкавую і ўнутраную будову, рост і развіццё, размнажэнне, жыццядзейнасць, адносіны да навакольнага асяроддзя, пашырэнне, паходжанне, эвалюцыйнае развіццё, пытанні класіфікацыі. Цесна звязана з інш. прыродазнаўчымі навукамі — фізікай, хіміяй, геалогіяй, глебазнаўствам, геаграфіяй, медыцынай, тэхн. навукамі, якія маюць дачыненне да выкарыстання і перапрацоўкі раслінпай сыравіны. Б. падзяляецца на многія самастойныя дысцыпліны: *марфалогія раслін, анатомія раслін, эмбрыялогія раслін*, цыталогія раслін (гл. *Цыталогія*), генетыка раслін (гл. *Генетыка*), *сістэматыка раслін, палеабатаніка*, або фітапалеанталогія, экалогія раслін (гл. *Экалогія*), *геаграфія раслін, геабатаніка, фізіялогія раслін*, біяхімія раслін (гл. *Біяхімія*). Вывучэнне асобных груп раслін вядуць раздзелы: *мікрабіялогія, альгалогія, мікалогія, ліхеналогія, брыялогія, дэндралогія, паліналогія*. На аснове Б. развіліся фітапаталогія і фармакалогія. Метады даследавання ў сучаснай Б. ў сувязі з развіццём сумежных навук (фізікі, хіміі, кіберпетыкі і інш.) удасканальваюцца і часта перакрыжоўваюцца. У марфалогіі асабліва вылучаецца вывучэнне паходжання і развіцця асобных органаў вышэйшых раслін. Развіваецца фізіял. анатомія раслін (метад культуры ізаляваных тканак, выкарыстанне электроннага мікраскопа). Шмат увагі аддаецца цытагенетыцы, усё глыбей вывучаюцца біяфізічныя і біяхімічныя закапамернасці спадчыннасці і зменлівасці. У сістэматыцы раслін распрацоўваецца філагенетычная сістэма раслінпага свету. Палеабатанікай сабраны матэрыялы з гісторыі раслінпага покрыва зямлі, шырока выкарыстоўваецца спорава-пылковы аналіз. Фітагеаграфічныя навукі (геабатаніка, экалогія, геаграфія раслін і інш.) шырока карыстаюцца метадам эксперыменту. У фізіялогіі раслін ужыванне метаду мечаных атамаў і метаду храматаграфіі памагло даследаваць прыроду хімізму фотасінтэзу. Папоўніліся веды аб працэсе дыхання раслін; больш глыбока вывучаны мінер. жыўленне, роля

мікраэлементаў у жыцці раслін, распрацоўваецца праблема павышэння ўстойлівасці раслін да неспрыяльных умоў (засухі, холаду, кіслотнасці і інш.); даследуецца роля карапёвай сістэмы ў абмене рэчываў, узнікла вучэнне пра фітагармоны. Высветлены некат. заканамернасці зменлівасці і спадчыннасці ў бактэрый, грыбоў; адкрыты антыбіётыкі, распрацоўваецца сістэматыка вірусаў, бактэрый. У сувязі з поспехамі ў галіне астраномії ўзнікла астрабатаніка. Праніканне чалавека ў космас выклікала неабходнасць падбору раслін — прадуцэнтаў кіслароду — для экіпажаў касм. караблёў. З поспехамі бат. навукі цесна звязана развіццё агранамічных дысцыплін.

Развіццё Б. ў СССР звязана з работай Батанічнага ін-та імя Камарова АН СССР (засн. ў 1714). Тут сабраны 5-мільённы гербарый вышэйшых раслін. Выдадзены шматтомныя апісанні флоры па прыродна-гістарычных раёнах СССР і манаграфіі па асобных групах каштоўных раслін, 30-томная «Флора СССР» — найлепшае ў свеце выданне такога тыпу. Выйшлі манаграфія «Раслінпасць СССР» і «Геабатанічная карта СССР» з 2 тамамі тлумачальнага тэксту. Праведзены шырокія даследаванні па інтрадукцыі раслін, пачата вывучэнне фотасінтэзу, воднага рэжыму і засухаўстойлівасці раслін. Напісаны класічныя працы па споравых раслінах, палеабатаніцы, цыталогіі, анатоміі і марфалогіі. Тут вялі даследаванні сусветна вядомыя вучоныя У. І. Ліпскі, А. А. Ячэўскі, У. А. Траншэль, М. І. Кузняцоў, У. Л. Камароў, М. А. Буш, Б. А. Федчанка, І. У. Палібін, А. Ф. Фляроў, У. М. Любіменка, А. А. Яленкін, І. В. Новапакроўскі, В. К. Шышкін, А. П. Шэннікаў і інш. Бат. даследаванні вядуць спецыялізаваныя ін-ты АН СССР: ін-т фізіялогіі раслін імя Ціміразева, ін-т біяхімії імя Баха, ін-т мікрабіялогіі, ін-т лесу, Галоўны бат. сад. Па пытаннях раслінаводства даследаванні вядуцца ў многіх установах Усесаюзнай акадэміі с.-г. навук імя У. І. Леніна (Усесаюзны ін-т раслінаводства, Усесаюзны ін-т кармоў імя Вільямса, спецыялізаваныя па розных культурах і групах культур ін-ты і доследныя станцыі). Вял. навуковую работу вядуць кафедры батанікі ў ВНУ.

У БССР бат. даследаваннямі займаецца ін-т эксперымент. батанікі АН БССР, дзе вывучаюцца экалогія, дэндралогія, фізіялогія, біяхімія раслін і інш. У ін-це сабраны гербарый кветкавых раслін — больш за 21 тыс. гербарных аркушаў. Тут, акрамя раслін бел. флоры, ёсць расліны з розных раёнаў СССР і пекат. краін Еўропы і Азіі; унікальны гербарый лішайнікаў (больш за 15 тыс. экз.— не толькі Беларусі, але і Фінляндыі, Польшчы, ЗША, Канады, Чэхаславакіі, Балгарыі). Выдадзена «Флора БССР» (т. 1—5), дзе апісана 1838 відаў кветкавых раслін, ёсць вызначальнікі гэтых раслін і лішайнікаў. Распрацавана раяніраванне лясной раслінпасці, складзена геабатанічная карта БССР. Даследаванні ў галіне Б. вядуцца таксама ў Цэнтр. батанічным садзе АН БССР, на кафедрах БДУ, Беларускай с.-г. акадэміі, педагагічных і с.-г. ін-таў. Сабраны каштоўныя калекцыі жывых раслін — у ЦБС АН БССР, у батанічных садах БДУ (Мінск, Шчомысліца) і Віцебскага пед. ін-та (Віцебск); у дэндралагічных садах Беларускай с.-г. акадэміі (Горкі), Тэхналагічнага ін-та (Мінск), Бел. НДІ лясной гаспадаркі (Гомель), Полацкага лясnога тэхнікума, Жорнаўскай лясной доследнай станцыі (в. Лапічы Асіповіцкага р-на). Развіццё Б. ў БССР звязана з імёнамі В. Ф. Купрэвіча (фізіялогія і сістэматыка ніжэйшых раслін), Ц. М. Годнева (фізіялогія і біяхімія раслін), М. Дз. Несцяровіча (дэндралогія), І. Д. Юркевіча (геабатаніка, лесазнаўства), М. П. Таміна (ліхеналогія), І. Г. Васількова (вышэйшыя расліны) і інш. Батанікі БССР — чл. ўсесаюзных навук. т-ваў: батанічнага, геаграфічнага, біяхімічнага і мікрабіялагічнага. Бел. адз. Усесаюзнага батанічнага т-ва ядпае больш за 400 батанікаў, мае 23 перыферыйныя арг-цыі; з 1959 выпускае зборнік «Батаніка».

Літ.: Курсанов Л. И. и др. Ботаника, 7 изд., т. 1, М., 1966; Жуковский П. М. Ботаника, 4 изд., М., 1964; Навука БССР за 50 год, Мн., 1968; Ботанический сад Академии наук БССР. Путеводитель, под ред. Н. В. Смольского, Мн., 1956.

Е. А. Кругаиава. Мінск.

БАТАНІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ, гл. *Геаграфія раслін.*

БАТАРЭЯ (франц. batterie ад лац. battuo б'юся), 1) тактычнае падраздзяленне ў артылерыі і ракетных войсках. Звычайна ўваходзіць у склад арт. дывізіёна, палка. У рус. арміі Б. як штатная агнявая адзінка існавала з 1833; раней так называлі любую колькасць гармат на адной пазіцыі (напр., батарэя Раеўскага ў Барадзінскай бітве 1812). У залежнасці ад тыпу ўзбраення Б. бывае пушачная, гаўбічная, мінамётная і інш. У артылерыі Б. называюць таксама падраздзяленні кіравання і разведкі (тапаграфічнай, гукаметрычнай, аптычнай). 2) Аб'яднанне некалькіх аднатыпных прылад, апаратаў, прыстасаванняў у адзіную сістэму для эфектыўнага сумеснага дзеяння. Напр., Б. радыятарная, коксавая. 3) Б. электрычная, сукупнасць хім. крыніц току (акумулятараў, гальванічных элементаў), тэрмаэлементаў або фотаэлементаў, злучаных паміж сабой. Каб павялічыць напружанне, элементы Б. злучаюць паслядоўна, а каб павялічыць ток — паралельна. 4) Б. атамная, крыніца эл. току, дзе энергія, якая выдзяляецца пры радыеактыўным распадзе, ператвараецца ў электрычную. Паводле спосабу ператварэння ядзернай энергіі падзяляюцца на 5 тыпаў. Крыніцай бэта-выпрамянення ў Б. служаць ізатопы (^{90}Ir, ^{143}Pr і інш.). Можа выкарыстоўвацца для сілкавання розных электра- і радыёпрыстасаванняў. 5) Б. сонечная, крыніца эл. току, якая складаецца з паўправадніковых фотаэлектрычных генератараў, што ператвараюць прамянёвую энергію Сонца ў электрычную. Выконваецца ў выглядзе панеляў, на якіх замацоўваецца шмат аб'яднаных фотаэлектрычных генератараў (сонечных элементаў). Магутнасць да некалькіх соцень ват. Сонечныя Б. шырока ўжываюцца ў сістэмах энергасілкавання касмічных лятальных апаратаў.

БАТАЎ Іван Андрэевіч [1767, Маскоўская губ.— 18(30).6.1841], рускі майстар муз. інструментаў. Да 55 гадоў прыгонны графоў Шарамецевых. Стварыў 41 скрыпку, 3 альты, 6 віяланчэляў і інш. Дасканаласць вырабу,

выдатныя гукавыя якасці прынеслі інструментам Б. сусв. вядомасць.

Літ.: Ямпольский И. Русское скрипичное искусство, [т.] 1, М.—Л., 1951.

БАТАЎ Павел Іванавіч [н. 20.5(1.6).1897, в. Філісава Рыбінскага пав. Яраслаўскай губ.], савецкі ваенны дзеяч, генерал арміі (1955), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1943, 1945). З сялян. Чл. КПСС з 1927. Да 1915 працаваў у Пецярбурзе, удзельнік 1-й сусв. вайны. У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнічаў у ліквідацыі белагвардзейскіх паўстанняў у Рыбінску, Яраслаўлі, Пашахоні; у 1939 — у вызваленні Зах. Беларусі (Ліды, Гродна, Вільні, Беласток), у 1939—40 — у сав.-фінляндскай вайне. У Айч. вайну абараняў Крым. З кастр. 1942 камандуючы 65-й арміі ў складзе Данскога фронту. Войскі, якімі камандаваў Б., 14—15.10.1943 каля Лоева Гомельскай вобл. фарсіравалі Дняпро і захапілі плацдарм на правым беразе; у чэрв.— ліп. 1944 удзельнічалі ў вызваленні Бабруйска, Мінска, Баранавіч, Слоніма і інш. гарадоў Беларусі; у крас. 1945 у авалоданні Шчэцінам. Пасля вайны першы нам. Галоўнакамандуючага сав. войск у Германіі, камандуючы ваен. акруг, Паўднёвай групы войск, начальнік штаба Аб'яднаных узброеных сіл краін Варшаўскага дагавору. Дэп. Вярх. Савета СССР 1, 2, 4—6-га скл. Чл. камітэта ветэранаў вайны СССР. Жыве ў Маскве. *В. С. Семенякоў.* Мінск.



БАТАХРОМЫ, атамныя групы, прысутнасць якіх у малекулах фарбавальнікаў паглыбляе колер і мяняе яго ў паслядоўнасці: бясколерны→жоўты→аранжавы→чырвоны→фіялетавы→сіні→блакітны→зялёны→→чорны. Гл. *Колернасці тэорыя.*

БАТКОЎСКІ Сяргей Барысавіч [н. 4(17).7.1917, Петраград], беларускі савецкі архітэктар. Засл. арх. БССР (1969). У 1940 скончыў Ленінградскі ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна. У 1940—46 у Сав. Арміі. З 1946 у Мінску. Працаваў у бел. філіяле Саюздзіпрагандлю, Прампраекце. З 1960 у Мінскпраекце. Асн. работы ў Мінску: жылы дом завода «Ударнік» (1957) і паліграфічны камбінат (1958, пл. Я. Коласа); комплекс будынкаў гадзіннікавага з-да (1965), прыгарадны чыг. вакзал (1955, усе з Н. Шпігельманам); Павільён ВДНГ БССР у Мінску (1968, з Ю. Градавым і Л. Левіным). Дзярж. прэмія БССР 1968 за ўдзел у стварэнні арх. ансамбля Ленінскага праспекта ў Мінску. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

БАТЛЕЙКА, б е т л е й к а (ад Betleem польская назва г. Віфлеема), беларускі народны тэатр лялек. Вядомы з 16 ст. Яго разнавіднасці: *жлоб, яселка.* Узнік пад уплывам падобных да Б. т-раў Польшчы (шопка) і Украіны (вяртэп). Узнікненне Б. звязана са святам каляд (адсюль назва Віфлеем, паводле рэліг. міфу — месца нараджэння Хрыста). Пашырэнню Б. спрыялі вандроўныя семінарысты, якія ўносілі ў рэпертуар Б. сюжэты школьнага т-ра. Паступова Б. з рук царкоўнікаў пераходзіць да мяшчан, сялян, становіцца цалкам народнай. У рэпертуар Б. разам з рэліг. п'есай «Цар Ірад», нар. драмай «Цар Максіміліян» уваходзілі жанравыя сцэны «Мацей і доктар», «Антон з казой і Антоніха», «Вольскі — купец польскі», «Бэрка-карчмар», «Цыган і цыганка», «Ванька малы», «Паніч» і інш. Насычаныя сац. сатырай, пабудаваныя на фальклорным матэрыяле, сцэнкі высмейвалі паноў, карчмароў і г. д., проціпастаўляючы ім станоўчых герояў з народу. Сцэнай служыла двухпавярховая скрыпка, што нагадвала царкву або хатку, паказы рабіліся на верхнім і ніжнім паверхах. Батлеечнікі (або «ралёшнікі») вадзілі драўляныя лялькі на шпянях па проразях у падлозе паверхаў. У паказах удзельнічала да 40 персанажаў. Вядома 6 тыпаў Б. Асаблівае месца займалі Б., зробленыя паводле прынцыпу ценявога т-ра (Віцебск, Веліж), і Б. з пераменлівымі празрыстымі дэкарацыямі (Докшыцы). У 19 ст. жанравыя сцэны Б. сталі выконвацца не толькі лялькамі, але непасрэдна акцёрамі. Гэты тып паказаў атрымаў назву «батлеі», «жывая Б.» і існаваў адначасова з Б. Апошні зафіксаваны паказ Б. адбыўся ў 1963 у Бялевічах Слуцкага р-на. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Романов Е. Белорусские тексты вертепного действа, Могилев, 1898 (Оттиск из: «Могилевские губернские ведомости», 1898, № 45, 46, 49—52); Шейн П. В. Вертеп или бетлейки (батлейки), у яго кн.: Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 3, СПб., 1902, с. 121—154; Карский Е. Ф. Рождественская вертепная драма, у яго кн.: Белорусы, т. 3, в. 3, П., 1922; Барышаў Г. і Саннікаў А. Беларускі народны тэатр батлейка, Мн., 1962 (бібліягр.); Бядуля З. Батлейка, «Вестник Народного Комиссариата просвещения ССРБ», 1922, № 3—4, в. 5—6; яго ж. Беларускі тэатр, там жа, 1922, окт.— нояб.; Дзешавой А. Докшыцкі лялечнік, «Маладосць», 1958, № 9. *Г. І. Барышаў.* Мінск.

БАТОМЕТР, гл. *Гідралагічныя прылады.*

БАТОРЫЙ (Batory) Стэфан (27.9.1533—12.12.1586, Гродна), трансільванскі князь [1571—1576], польскі кароль (выбраны ў снежні 1575, каранаваны ў маі 1576). Вучыўся ў Падуанскім ун-це. Стаў каралём насуперак волі магнатаў паводле патрабавання дробнамаянтковай шляхты, даў ёй многа прывілей. У 1579—82 удзельнічаў у Лівонскай вайне, узяў Полацк, Вялікія Лукі. Пасля няўдалай асады Пскова заключыў у Яме-Запольскім мір з Рус. дзяржавай (1582). Далучыў да Польшчы Лівонію. Імкнуўся да абсалютызму. У барацьбе з магнатамі апіраўся на каталіцкую царкву і езуітаў. Для акаталічвання насельніцтва Беларусі, Украіны, Расіі заснаваў езуіцкія школы ў Полацку, Дэрпце, акадэмію ў Вільні.

БАТОРЫН (Б а т о р ы н а), возера ў бас. р. Нарач, правага прытока Віліі, у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. Пл. 6,25 *км²*. Даўж. 3,9 *км*, найб. шыр. 2,4 *км*, сярэдняя 1,78 *км*, сярэдняя глыб. 2,4 *м*, найб. 5,5 *м*. Катлавіна плоская, адкрытая, выцягнута з ПнЗ на ПдУ, Берагі нізкія, нярэдка забалочаныя, затарфаваныя, на Пн і ПдУ выш. 2—3 *м*. Дно плоскае. Ложа ўслана заіленымі пяскамі і грубадэтрытавымі сапрапелямі. Вадазбор (92,4 *км²*) узгорыста-марэнны і раўнінны. Воз. эўтрофнага тыпу, зарастае. Шырыня палосы паўапушчанай расліннасці ад 10 да 100 *м*. Далей да цэнтра палоса рдзестаў. Сцёк у воз. Мястра па пратоцы (даўж. 1,4 *км*, шыр. 8—10 *м*). Водзяцца лешч, шчупак, карась, акунь, лінь.

БАТОЎКІН Мікіта Ермалаевіч (1873, Прапойская вол. Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.— 15.1.1947), вядомы беларускі жывёлавод, актыўны ўдзельнік калг. буд-ва. Чл. КПСС з 1939. Больш за 12 гадоў узначальваў конегадоўчую ферму калгаса «Кастрычнік» Прапойскага (з 1945 Слаўгарадскага) р-на, адну з лепшых на Беларусі, якая ў 1939 была ўдзельнікам Усесаюзнай с.-г. выстаўкі ў Маскве. У Айч. вайну інструктар Гал. ўпраўлення конегадоўлі Наркамзема СССР. Пасля вайны нам. старшыні калгаса «Кастрычнік», заг. каняфермы. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—2-га скл. Узнаг. ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

БАТРАКІ (п а р а б к і), сацыяльная група, частка с.-г. пралетарыяту з невялікім зямельным надзелам або зусім без зямлі, для якой работа па найме з'яўляецца галоўнай крыніцай існавання. Батрацтва — непазбежны вынік развіцця капіталізму ў с. гасп., вядзе да збяднення большай часткі *сялянства.* У царскай Расіі ў памешчыкаў і кулакоў працавала каля 1/5 усіх сялян. У дарэвалюц. Беларусі, дзе большасць сялянскіх гаспадарак былі беззямельныя ці малазямельныя, у пач. 20 ст. налічвалася 150 тыс. с.-г. рабочых, батракоў. Да Кастр. рэв. колькасць іх павялічылася. У Зах. Беларусі да 1939 было больш за 70 тыс. Б. Існавалі розныя катэгорыі Б. Найбольш пашыраныя батракі-ардынарыі — пастаянныя работчыя ў памешчыцкіх маёнтках. Наймаліся па дагаворы на год. Батракі-пасылкі — пераважна дзеці ардынарыяў — бясплатна выконвалі падсобныя работы. Калі ў ардынарыя не было дзяцей, ён наймаў пасылак за свой кошт. Жылі Б. ў цяжкіх умовах, атрымлівалі мізэрную (намнога меншую за рабочых у горадзе) заработную плату, якая зменшвалася шматлікімі штрафамі і наборамі. Пасля Кастр. рэв. многія Б. атрымалі зямлю, інвентар і сталі самастойнымі гаспадарамі. Перамога калгаснага ладу ў СССР канчаткова ліквідавала аснову батрацтва. Ліквідавана яно ў асноўным і ў інш. краінах, якія сталі на шлях сацыялістычнага развіцця.

У капіталіст. краінах не спыняецца масавае абядненне фермераў, якія не вытрымліваюць вострай канкурэнтнай барацьбы і папаўняюць армію с.-г. рабочых, у т. л. і Б. У ЗША колькасць фермаў за 1959—64 паменшала на 500 тыс. У Вялікабрытаніі штогод с. гасп. пакідала каля 20 тыс., у Францыі — 80 тыс., у ФРГ — 70 тыс. чалавек. У працэсе расслаення сялянства ўзмацняецца эксплуатацыя і галеча, што вядзе да абвастрэння класавай барацьбы. Напр., у Італіі ў 1949 заставала 70 тыс., у 1955 — 853 тыс. с.-г. рабочых, а ў маі 1969 праведзена агульнанац. 48-гадзінная забастоўка, у якой удзельнічала 1800 тыс. с.-г. рабочых, сярод іх многа Б.

Літ.: Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Поли. собр. соч., т. 3); яго ж. Новыя даныя аб законах развіцця капіталізму ў земляробстве, Тв., т. 22 (там жа, т. 27); Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962. *М. П. Шэндарай.* Мінск.

БАТРАКОЎ Міхаіл Рыгоравіч (5.8.1922, в. Радуга Гомельскага пав.— 16.1.1945), Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Працаваў на будаўніцтве ў Гомелі. У Айч. вайну ўдзельнічаў у баях на Паўн. Каўказе, Кубані, у Крыме, на Беларусі, у Літве. Вызначыўся пры вызваленні Прыбалтыкі. 26.7.1944 танкавая рота, якою камандаваў Б., у цяжкіх баях прарвала абарону ворага каля Каўнаса. Але ў варожым тыле шлях ёй заслалі 30 фаш. танкаў. Сав. танкісты адбілі 4 атакі, знішчылі 14 танкаў, у т. л. 4 знішчыў сам Б. Загінуў у баі. Пахаваны ў г. Кібартай Літ. ССР.




БАТРАХАЛОГІЯ (грэч. bátrachos жаба + +...*логія*), навука пра земнаводных, раздзел *заалогіі.*

БАТРЫЯМІКОЗ (грэч. bótrys гронка+mýxes грыб), хранічная інфекцыйная хвароба жывёл, якая суправаджаецца запаленчым, падобным на пухліну, разрастаннем злучальнай тканкі. Хварэюць пераважна коні, радзей буйн. раг. жывёла, авечкі, свінні. Узбуджальнік хваробы — грыбок Batryomyces ascoformans — жыве на сене, саломе, у гнаі. Трапляе ў арганізм праз раны (пры кастрацыі), драпіны, намуленую скуру або пратокі потавых і тлушчавых залоз; пашкоджвае мышцы, лімфатычныя вузлы, вымя, семянны канацік. Лячэнне хірургічнае. Прафілактыка: карыстанне добра прыгнанай збруяй, захаванне гігіены пры кастрацыі і інш.

Літ.: Оливков В. М. Общая хирургия домашних животных, 2 изд., М., 1954.

БАТСВАНА (Botswana), дзяржава ў Паўд. Афрыцы. Уваходзіць у склад Садружнасці, якую ўзначальвае Вялікабрытанія. Пл. 712 тыс. *км²*. Нас. 0,6 млн. чал. (1969). Сталіца Габаронес. Падзяляецца на 13 акруг. Б.— рэспубліка (паводле канстытуцыі 1966). На чале дзяржавы і ўрада стаіць прэзідэнт. Заканадаўчая ўлада належыць прэзідэнту і Нац. сходу. Урад (кабінет) складаецца з прэзідэнта, віцэ-прэзідэнта і 6 міністраў.



Прырода. Тэр. Б. займае вялікую бясспёкавую катлавіну Калахары, абмежаваную з усіх бакоў плато. Сярэдняя выш. 800—1000 *м*, на З да 1300 *м* (г. Цодыла). Рэльеф раўнінны, на У слабахвалісты. Здабываюцца марганец, азбест, серабро, золата; знойдзены алмазы, пікель і медзь. Клімат трапічнага пояса, гарачы, засушлівы. Сярэдняя т-ра студз. 21—27, ліп. каля 16 °С. Ападкаў на Пн і У 500—700 *мм*, у Калахары 250 *мм* за год. Дажджы са снежня да красавіка. У Калахары пастаянных рэк няма. На Пн бяссцёкавы басейн р. Акаванга, на У р. Лімпопа з прытокамі. Расліннасць пераважна савановая (у цэнтры тыповая, на ПдЗ апустыненая), на Пн трапічнае рэдкалессе. Па далінах рэк на Пн, У, Пд — галерэйныя лясы.

Насельніцтва. Больш за 95% афрыканцы, пераважна бечуаны (70%; адносяцца да моўнай групы паўд.-афр. банту), мапона (12%). У Калахары вандруюць групы бушменаў (каля 40 тыс.). Афіц. мова — англійская і тсвана. Сярод веруючых пашыраны культ продкаў, каля ¼ веруючых — хрысціяне. Шчыльн. насельніцтва 0,8 чал. на 1 *км*². Большая частка насельніцтва сканцэнтрава-

Габаронес. Цэнтральная плошча.



на на ПдУ. Асаблівасцю ўсх. часткі Б. з'яўляюцца вёскі-гіганты (Серове і Канье, па 30 тыс. ж.). Традыцыйнае жыллё бечуанаў — круглыя ў плане хаціны з канічным дахам, плеценыя з прутоў на драўляным каркасе і абмазаныя глінай. Вокнаў звычайна няма, падлога гліняная з выемкаю для агнішча. Хатнія рэчы бечуаны аздабляюць разьбяным геам. (часцей зігзагападобным) арнаментам, робяць разьбяныя лыжкі з ручкамі ў выглядзе чалавека або жывёлы (найчасцей жырафы), плятуць цыноўкі, вырабляюць дываніі са шкур жывёл. Пашыраны ўпрыгожанні з бісеру, меднага дроту і жалеза.

Гістарычная даведка. Шмат стагоддзяў назад бечуаны пасяліліся на тэр. Паўд. Афрыкі. У 19 ст. іх землі сталі аб'ектам англа-бурскай каланізацыі. У 1885 Англія абвясціла землі бечуанаў пратэктаратам (Бечуаналенд) і ўсталявала калан. рэжым. Нац.-вызв. рух у В. вымусіў брыт. ўрад у 1961 «дараваць» пратэктарату канстытуцыю. У пач. 1963 эканам. стачка ў Франсістаўне перарасла ў шырокую паліт. забастоўку. У ліст. 1963 Англія дала пратэктарату самакіраванне. На выбарах у заканадаўчы сход 1.3.1965 перамагла Дэмакр. партыя. Яе лідэр С. Кхама ўтварыў першы ўрад. 30.9.1966 Бечуаналенд абвешчаны незалежнай рэспублікай Б. Прэзідэнтам стаў С. Кхама. В.— чл. ААН з 1966.

Гаспадарка. Б. — аграрная краіна, адна з самых адсталых у Афрыцы. Прамысловасці фактычна няма, узровень развіцця с. гасп. вельмі нізкі. Гал. галіна гасп. — жывёлагадоўля. Яе прадукцыя складае 75% экспарту. У 1965 ад моцнай засухі загінула больш як ⅓ пагалоўя. У 1967 было (тыс. гал.) буйн. раг. жывёлы 1105, авечак і коз 858. Пасевы збожжавых (кукурузы, проса) займаюць каля 6% прыгоднай для апрацоўкі зямлі пераважна на Пд і У. На экспарт вырошчваюць бавоўну. Здабыча марганцавых рудаў (4,1 тыс. *т*, 1965), азбесту, кіяніту і золата. Моцны ўплыў на эканоміку маюе ПАР і часткова Вялікабрытанія. Б. аб'яднана з ПАР валютным і тарыфным пагадненнем. Частыя засухі і паморак жывёлы выклікаюць галадоўкі. Многія бечуаны вымушаны ісці на сезонныя заработкі за мяжу. Каля 30% дарослага мужчынскага насельніцтва ў 1967 працавала ў ПАР. З-за засухі 1964—66 Б. толькі ў 1967 пачала выконваць 1-ы план развіцця гаспадаркі на 1966—71, які прадугледжвае капіталаўкладанні ў 22,8 млн. ф. ст. З будаўніцтвам прамой чыгункі паміж ПАР і Радэзіяй Б. пазбавілася даходу ад транзітных перавозак. Даўжыня адзінай чыгункі 634 *км*, шашэйных аўтамаб. дарог каля 800 *км*. Грашовая адзінка — рэнд ПАР.

Асвета. Пачатковая школа 7 і 8-гадовая, прымае дзяцей з 6 гадоў. У 1—4-м класах вучацца на мясцовай, з 5-га на англ. мове. Сярэдняя школа 5-гадовая (першыя 3 гады — няпоўная). У 1965/66 навуч. г. ў пач. школах займалася 66 061, у сярэдніх 1325 вучняў; прафесіян. падрыхтоўку (на базе пач. школы) праходзіла 102 чал. Настаўнікаў пач. школы рыхтуюць пед. вучылішчы. У 1965/66 навуч. г. ў пед. вучылішчах займалася 268 чал. Вышэйшую адукацыю насельніцтва можа атрымаць толькі за мяжой. Н.-д. работу вядуць вет. і геал. службы.

Літ.: Потехин И. И. Формирование национальной общности южноафриканских банту, М., 1955 (Труды ин-та этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая АН СССР, т. 29).

БАТУЛІЗМ, алантыязіс (ад лац. botulus каўбаса), цяжкая атручальна-інфекцыйная хвароба. 1) У чалавека выклікаецца бактэрыямі (Bacillus botulinus) і іх ядамі (таксінамі), якія трапляюць у арганізм з недабраякаснымі харч. прадуктамі (мяса, рыба, кансервы і інш.).

Інкубацыйны перыяд ад 2 *гадз* да 10 дзён. Прыкметы: парушэнне зроку, замінка глытання, страта голасу, параліч мышцаў, парушэнне нервовай сістэмы (агульная слабасць, галавакружэнне). Арганізм хворых на Б. імунітэту не выпрацоўвае. Лячэнне: спецыфічная антытаксічная сываратка, прамыванне страўніка і кішак. Прафілактыка: выкананне асн. санітарна-гігіенічных правілаў апрацоўкі, транспарціроўкі, хавання і прыгатавання харч. прадуктаў.

Л. М. Гаршанава. Мінск.

2) У жывёл атручэнне бывае ад недабраякаснага корму, у якім ёсць таксін палачкі батулінусу. Крыніца інфекцыі — глеба. Споры ўзбуджальніка хваробы трапляюць у корм і прарастаюць. У працэсе вегетацыі і размнажэння бактэрый у корме намнажаецца таксін, які выклікае атручэнне. Крыніцай таксіну могуць быць таксама трупы звяркоў (кратоў, мышэй, пацукоў).

Асн. сімптом Б. ў жывёлы — параліч мускулатуры, пераважна жавальнага і глытальнага апаратаў. Часцей атручваюцца коні, птушкі, радзей буйн. раг. жывёла і свінні, з пушных звяроў — норкі. Інкубацыйны перыяд (24 *гадз* — 10—12 дзён) залежыць ад колькасці таксіну і супрацьлягласці арганізма. Хвароба цягнецца 1—5, радзей 5—10 дзён. Дыягназ ставіцца на падставе клінічных прыкмет і пацвярджаецца біял. даследаваннем мачы і крыві хворых жывёл. Лекавыя сродкі: слабільныя (арэкалін, пілакарпін, азерын) і полівалентныя сываратка, прамыванне страўніка растворам марганцавакіслага калію, содай. Прафілактыка патрабуе не дапускаць, каб корм забруджваўся зямлёй і выдзяленнямі грызуноў, падтрымліваць чысціню ў памяшканнях.

Літ.: Матвеев К. И. Ботулизм, М., 1959 (бібліягр.); Ботулизм, у кн.: Руководство по микробиологической диагностике инфекционных болезней, М., 1964.

Р. У. Гузава. Мінск.

БАТУМІ, горад на паўднёва-ўсходнім узбярэжжы Чорнага м., з 16.7.1921 сталіца Аджарскай АССР. Вялікі порт, чыг. ст., аэрапорт. 101 тыс. ж. (1970). Эканам. і культ. цэнтр Аджарыі. У 11 ст. на месцы Б. ўзнікла крэпасць Тамарысцыхе, пазней горад пад назвай Батомі. З 13 ст. належаў мінгрэльскім князям. У 1878 далучаны да Рас. імперыі. У канцы 19 — пач. 20 ст. порт і гандл.-прамысл. цэнтр Расіі. У крас. 1918 захоплены туркамі. Пасля англ. акупацыі (снеж. 1918 — ліп. 1920) перайшоў пад уладу груз. меншавікоў. Сав. ўлада ўстаноўлена ў сак. 1921. Прамысловасць нафтаперапр., маш.-будаўнічая (абсталяванне для чайнай, вінаробнай, кансервавай прамысл.), суднабудаўнічая (судны на падводных крылах), электратэхн. (пральныя машыны, электракары, электраприлады), харчовая (чайныя ф-кі, цытрусавы камбінат, тытунёва-ферментацыйны з-д), фанерная і дрэваапрацоўчая (ф-кі бамбукавых вырабаў і гнутай мэблі), лёгкая. Цыкавальны, кафеінавы, ліцейна-механічны з-ды, домабудаўнічы камбінат. Пед. ін-т, філіял Грузінскага політэхн. ін-та, 6 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. т-р, 2 музеі. Паблізу Б. прыморскія курорты.

БАТУТ (падкідная сетка), спартыўны снарад для скачкоў. Плеценая сетка прымацоўваецца да метал. рамы з дапамогай амартызатараў (гумы, спружыны). Дзякуючы пругкасці амартызатараў спартсмен скача ўверх і выконвае розынабаковыя сальта, павароты, абароты і вінты. Скачкі на Б. развіваюць спрыт, смеласць, пачуццё арыенціроўкі ў прасторы, устойлівасць вестыбулярнага апарату і ўжываюцца ў падрыхтоўцы лётчыкаў, касманаўтаў, у практыцы многіх відаў спорту, у цыркавым мастацтве.

У СССР скачкі на Б. пашыраюцца з 1932, а з 1965 уключаны ў праграму спаборніцтваў па спарт. акрабатыцы. Першым чэмпіёнам СССР па скачках на Б. сярод жанчын была мінчанка Л. Зданюк (1967).

БАТЧЫ, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Запаветы Ільіча». За 12 *км* на ПнЗ ад Кобрына, 63 *км* ад Брэста, 11 *км* ад чыг. ст. Кобрын. 339 ж., двароў 122 (1970). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Фашысты спалілі 8 двароў і расстралялі 15 жыхароў Б.

БАТЫЙ, Бату, Саін-хан (г. н. невяд.— п. 1255), мангольскі хан, военачальнік, унук *Чынгіскана*. З 1227 кіраваў улусам Джучы. У 1236—43 узначаліў паход ва Усх. Еўропу: у 1236 захапіў землі волжскіх балгар і Палавецкія стэпы, у 1237—40 завяваў Паўн.-Усх. і Паўд.-Зах. Русь, у 1241—42 уварваўся ў Польскую Галіцыю, у Венгрыю і Далмацыю. Аднак аслабленыя барацьбою з рус. княствамі войскі Б. пацярпелі паражэнні ў Чэхіі і Венгрыі. У 1243 вярнуўся на Волгу і заснаваў дзяржаву *Залатая Арда* са сталіцай Сарай-Бату (каля Астрахані). Жорстка эксплуатаваў завяваныя народы. З заваёў Б. пачалося цяжкае шматгадовае панаванне татара-манголаў на Русі.

Літ.: Греков Б. Д. и Якубовский А. Ю. Золотая Орда и ее падение, М.— Л., 1950.


БАТЫРАЎ Пётр Міхайлавіч (3.1.1918, в. Чулпанава Падольскага пав. Маскоўскай губ.— ліп. 1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС. На фронце з 1942, лётчык-знішчальнік. Зрабіў 330 баявых вылетаў, у т. л. 212 разведвальных. Удзельнічаў у 52 паветраных баях, збіў 5 варожых самалётаў. Летам 1944 нам. камандзіра па паветрана-стралковай службе знішчальнага авіяпалка Б. правёў разведку варожых рубяжоў абароны і перапраў ворага на Проні, Дняпры, Бярэзіне, яго эшалонаў на чыг. Магілёў — Орша, сіл акружанай групоўкі каля Шклова; ударамі з паветра прычыніў фашыстам вялікія страты. Загінуў у паветраным баі. Пахаваны ў г. п. Жалудок Гродзенскай вобл.

БАТЫСКАФ (грэч. bathýs глыбокі+ +skáphos судна), аўтаномны самаходны апарат для глыбакаводных даследаванняў. У Б. назіральная кабіна (*батысфера*) знаходзіцца пад днішчам судна, якое мае выгляд падводнай лодкі. Апусканне на глыбіню і ўсплыванне Б. рэгулююцца баластам. На судне ўстаноўлены электрарухавікі з грабнымі він-

тамі, якія сілкуюцца ад акумулятарных батарэй. Шахта злучае корпус судна з кабінай, дзе размешчаны апараты і прылады кіравання, рэгенерацыі паветра, радыё- і ультрагукавыя станцыі для сувязі адпаведна ў надводным і падводным становішчы. Упершыню аўтаномны гідрастат (падводны плавальны апарат) для апускання на 2400 *м* распрацаваў Ю. А. Шыманскі (СССР) у 1937. Будаваць Б. пачаў у 1945 А. Пікар (Бельгія) і ў 1948 выпрабаваў яго на глыб. 1380 *м*. У 1960 яго сын І. Пікар дасягнуў глыб. 10 019 *м* (Марыянская ўпадзіна ў зах. частцы Ціхага ак.). Б. карыстаюцца для гідрафізічных, біялагічных, геалагічных, гідрааптычных і інш. даследаванняў марскіх глыбінаў.

Г. Ф. Свяглоў. Мінск.

БАТЫСФЕРА (ад грэч. bathýs глыбока+ +sphaira шар), стальная назіральная камера сфера-цыліндрычнай ці сферычнай формы для даследавання марскіх глыбінаў, плыняў, вывучэння падводнай флоры і фаўны, дна мора; выкарыстоўваецца пры падыманні затанулых суднаў. Сканструявана ў 1892 італьянцам Бальзамела, які дасягнуў глыб. 165 *м*. Б. апускаецца на стальным тросе з судна або разам з аўтаномным гідрастатам. Гл. *Батыскаф*.



Будова батысферы: *1* — сярэдняе глядзельнае акно; *2* — барометр; *3* — тэрмометр і гігрометр; *4* — левае глядзельнае акно; *5* — вентылі кіслародных балонаў; *6* — тэлефонная батарэя; *7* — уваходны лаз; *8* — прыстасаванне для паглынання CO_2; *9* — кіслародныя балоны; *10* — тэлефон; *11* — пражэктар; *12* — рэастат пражэктара; *13* — вілка і кабель электраэнергіі і тэлефона.

БАТЫЯЛЬ, батыяльная зона (ад грэч. bathýs глыбокі), зона Сусветнага акіяна паміж нерытавай і абісальнай на глыбіні ад 200 да 2000 *м*. Геамарфалагічна адпавядае зоне мацерыковага схілу. Займае каля 20% плошчы акіяна. Схіл пакаты (4—12°), часам стромкі (да 40—50°), звычайна ўскладняецца скідава-глыбавымі парушэннямі, парэзаны падводнымі каньёнамі. У межах Б. пануюць прыдонныя цячэнні, прыліўна-адліўныя рухі вады, падводнае апаўзанне, суспензійныя патокі і інш. геал. працэсы, намнажаюцца *батыяльныя адклады*. Характэрна амаль поўная адсутнасць святла. Расліннасць бедная, фаўна пераходная да абісальнай.

БАТЫЯЛЬНЫЯ АДКЛАДЫ, марскія адклады батыяльнай зоны Сусветнага акіяна (гл. *Батыяль*). Займаюць больш за 19% паверхні ў межах мацерыковага схілу. Утвараюцца пераважна з прынесенага з сушы тэрыгеннага і вулканагеннага матэрыялу. Гэта найчасцей сінія, чырвоныя, зялёныя, шэрыя вулканічныя і вапняковыя ілы, глыбакаводныя пяскі, часам галечнікі. У працэсе дыягенезу на працягу геал. часу ператвараюцца ў гліны, мергелі, вапнякі і інш.

БАТЭРСТ (Bathurst), сталіца Гамбіі, на в-ве Сент-Мэры ў вусці р. Гамбія. Рачны і марскі порт. Міжнар. аэрапорт. 43 тыс. ж.



1477—78), «Нараджэнне Венеры» (каля 1483—84) і шматлікіх «Мадоннах» Б. стварыў паэтычна абагульненыя, поўныя светлага летуцення гарманічныя вобразы. Далікатнасць фігур, лёгкія трапяткія лінейныя рытмы, празрыстасць фарбаў ствараюць атмасферу элегічнага смутку, прасякнутага ўнутраным неспакоем. У многіх партрэтах таго часу Б. дасягае выключнай тонкасці і вастрыні ў раскрыцці складаных нюансаў унутранага стану чалавека. Сац. перамены ў Фларэнцыі ў 90-я г. 15 ст. (выгнанне Медычы, праўленне Саванаролы, яго выкрывальныя рэліг.-містычныя пропаведзі) зрабілі ўплыў на Б. У яго творчасці ўзнікаюць драматызм, маралізатарскія ноты і рэліг. экзальтацыя, перавялічаная экспрэсія вобразаў («Паклён», пасля 1495); «Сцэны з жыцця св. Зіновія» (каля 1505). Асобна стаяць яго малюнкі (1492—97) да «Боскай камедыі» Дантэ з лёгкімі, поўнымі прывіднай гармоніі вобразамі. Творчасць Б., якая адлюстравала глыбокія супярэчнасці духоўнага жыцця Фларэнцыі канца 15 ст., стаіць на мяжы рэнесанса і Высокага Адраджэння.

Літ.: Гращенков В. Н. (сост.). Сандро Боттичелли. Альбом репродукций, М., 1960; Смирнова И. А. (сост.). Сандро Боттичелли. Альбом репродукций, М., 1967; Боттичелли. Сб. материалов о творчестве, пер. с франц., англ., итальян., М., 1962; Venturi L. Botticelli, 2 ed., Paris, 1949.

Т. С. Галенка. Масква.

(1967). Прадпр. для перапрацоўкі арахісу, выраб катэраў і лодак, саматужныя промыслы. Вываз арахісу. Настаўніцкі каледж.

БАТЭРФЛЯЙ, спосаб *плавання*.

БАЎМ Уладзімір Аляксандравіч (н. 6.8. 1922, в. Карыцкі Бельскага пав. Беластоцкага ваяводства), гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1951. Удзельнік Айч. вайны. У 1947—54 працаваў на прадпр. Гродна. З 1954 старшыня калгаса імя XXII з'езду КПСС (да 1961 калгас «Стахановец») Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. На XXV з'ездзе Кампартыі Беларусі выбраны чл. Рэвізійнай камісіі КПБ. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Літ.: Міско Я. Почырк камуніста, у кн.: Сцяганосцы новага, перадавога, Мн., 1967.

БАЎМАН Карл Янавіч (29.8.1892, Ліфляндская губ.— 14.10.1937), савецкі партыйны дзеяч. Чл. КПСС з 1907. Вёў рэвалюц. работу ў Латвіі, Пскове, Кіеве. Пасля Кастр. рэвалюцыі на парт. рабоце: з 1920 сакратар Курскага губкома РКП(б), з 1923 у ЦК і МК ВКП(б); з 1929 першы сакратар Маскоўскага абкома, сакратар ЦК ВКП(б), канд. у чл. Палітбюро ЦК ВКП(б); з 1930 сакратар ЦК ВКП(б), чл. Аргбюро ЦК ВКП(б). У 1931—34 першы сакратар Сярэднеазіяцкага бюро ЦК ВКП(б); у 1934—37 заг. аддзела навукі ЦК ВКП(б). На XIV—XVII з'ездах ВКП(б) выбіраўся чл. ЦК.

Літ.: Зданович С. Карл Бауман, М., 1967.

БАЎМАН Мікалай Эрнеставіч (29.5.1873, Казань — 31.10.1905), прафесіянальны рэвалюцыянер. З 1896 у *Пецярбургскім «Саюзе барацьбы за вызваленне рабочага класа»*. У сак. 1897 арыштаваны і ў 1899 высланы ў Вяцкую губ., адтуль уцёк за мяжу. Памочнік У. І. Леніна ў стварэнні «Искры», агент і транспарціроўшчык газеты ў Расію. У 1903 узначаліў Маскоўскую арг-цыю бальшавікоў, а з 1904 і Паўн. бюро ЦК РСДРП. Дэлегат II з'езду партыі, на ім выступаў як паслядоўнік У. І. Леніна. З чэрв. 1904 да кастр. 1905 у турме. Забіты чарнасоценцам у час рэвалюц. дэманстрацыі ў Маскве. Пахаванне Б. ператварылася ў магутную паліт. дэманстрацыю працоўных. Яго імем названы раён Масквы, Маскоўскае вышэйшае тэхн. вуч., плошчы і вуліцы ў многіх гарадах СССР.



Літ.: Ленін У. І. Мікалай Эрнеставіч Бауман, Тв., т. 9 (Полн. собр. соч., т. 12); Новосе-лов М. Николай Эрнестович Бауман. 1873—1905, 2 изд., М., 1955.


БАЎРЫН Віталій Іванавіч (н. 1.4.1919, в. Бозна Вяземскага пав. Смаленскай губ.), дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1949. Скончыў Маскоўскі пушна-футравы ін-т (1942). Удзельнік Айч. вайны. У 1948—51 ст. навук. супрацоўнік, вучоны сакратар Гал. ўпраўлення па запаведніках пры СМ БССР, нам. дырэктара Бел. дзярж. запаведніка на р. Бярэзіне. З 1951 інструктар с.-г. аддзела Мінскага абкома КПБ. У 1953—58 сакратар Дзяржынскага райкома КПБ, старшыня Дзяржынскага райвыканкома. З 1958 першы сакратар Старадарожскага райкома КПБ, з 1961 нам. загадчыка, з 1965 заг. с.-г. аддзела ЦК КПБ. З 6.8.1969 міністр мясной і малочнай прамысловасці БССР. На XXIV і XXV з'ездах выбраны кандыдатам, на XXVI — чл. ЦК КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га і 7-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

БАЎЭР Таццяна Стафанаўна (13.4.1924, Масква — 13.6.1944), разведчыца на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Дачка венг. камуніста — удзельніка венг. рэвалюцыі 1919. Чл. ВЛКСМ. У 1941 добраахвотна пайшла на фронт, удзельнічала ў дэсантнай аперацыі на Смаленшчыне, у баях пад Масквой (разведчыца і мед. сястра). У пач. жн. 1942 у складзе спец. групы закінута на акупаваную тэр. Беларусі. Вяла разведвальную і дыверсійную работу ў Мінску, перадавала камандаванню Чырв. Арміі звесткі пра ворага, здабывала зброю, боепрыпасы, медыкаменты для партызанаў, распаўсюджвала сав. газеты і лістоўкі. З 1943 у складзе спец. групы на тэр. Мінскай вобл. Загінула ў баі з карнікамі пад в. Макаўе Бягомльскага р-на. Яе імем названа адна з вуліц Будапешта. Узнаг. ордэнам Айч. вайны 1-й ступені.



БАФІНА МОРА (Baffin Bay), паўзамкнёнае мора Паўночнага Ледавітага ак. паміж а-вамі Грэнландыя, Бафінава Зямля, Дэван і Элсмір. На Пд Дэвісавым пралівам злучаецца з Атлантычным ак. Пл. 689 тыс. км². Глыб. да 2136 *м*. Т-ра вады на паверхні зімой ніжэй за 0, летам ад 0 да 5 °С; салёнасць 30,0—32,0‰. Ледастаў з кастрычніка да ліпеня.

БАХ Аляксей Мікалаевіч [17(29).3.1857, г. Залатаноша Палтаўскай губ.— 13.5.1946], заснавальнік савецкай біяхіміі. Акад. АН СССР (1929). Герой Сац. Працы (1945). У 1875 паступіў у Кіеўскі ун-т. У 1878—81 за паліт. выступленні быў у ссылцы. Вярнуўшыся ў Кіеў, уступіў у партыю «Народная воля». З 1883 у рэвалюц. падполлі, агітатар у Яраслаўлі, Казані, Растове, Пецярбурзе, Маскве.



У 1883 напісаў папулярную ў свой час кнігу «Цар-голад», у якой раскрываў заганы самадзяржаўя. З 1885 да 1917 у эміграцыі (Францыя, Швейцарыя); там вёў навук. даследаванні па біяхіміі. Б.— ініцыятар арганізацыі Фізіка-хім. ін-та імя Карпава (1922), Біяхім. ін-та Нар. камісарыята аховы здароўя РСФСР (1921), Ін-та біяхіміі АН СССР (1935), заснавальнік час. «Биохимия» (1936). Распрацаваў пераксісную тэорыю працэсаў павольнага акіслення ў раслінных і жывёльных арганізмах (1897), якая мае асаблівае значэнне для вывучэння хімізму дыхання. Работы Б. па хіміі ферментаў стварылі аснову тэхналогіі харч. прамысловасці. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна.

Тв.: Собрание трудов по химии и биохимии, М., 1950.

Літ.: Бах Л. А. и Опарин А. И. Алексей Николаевич Бах, М., 1957; Труды совещания, посвященного 50-летию перекисной теории медленного окисления и роли А. Н. Баха в развитии отечественной биохимии, М.—Л., 1946.

БАХ (Bach) Іаган Себасцьян [21(31).3.1685, Эйзенах — 28.7.1750], нямецкі кампазітар, арганіст і клавесініст. З сям'і патомных музыкантаў. Служыў арганістам і капельмайстрам у невялікіх правінцыяльных гарадах. Веймарскі перыяд (1708—17) — час творчай сталасці, калі ў арганных кампазіцыях і кантатах цалкам склаўся арыгінальны стыль Б. З кётэнскім перыядам (1717—23) звязаны росквіт інстр. музыкі Б., паглыбленне драм. асновы ў яго творчасці. Самым плённым стаў лейпцыгскі перыяд (1723—50). Б. атрымаў магчымасць наблізіцца да дэмакр. аўдыторыі як кантар царквы св. Фамы і кіраўнік Калегіум музікум (так звалася ў тагачаснай Зах. Еўропе аб'яднанні аматараў і музыкантаў-прафесіяналаў з бюргерскага і студэнцкага асяроддзя). Напісаныя ў Лейпцызе свецкія кантаты падрыхтавалі зінгшпіль — нац. ням. разнавіднасць камічнай оперы. Найб. значныя манумент. творы Б. на рэліг. тэматыку (пасіі, магніфікат, араторыі, месы). У традыц. культавыя формы Б. укладаў гуманіст. змест, спалучаючы дзівосную шматграннасць лірыкі з пастаноўкай высокіх маральна-этычных, філас. праблем. Яго меса сі-мінор (1733—38) і лепшая аратарыяльная кампазіцыя «Пасіі па Матфеі» (на тэкст з Евангелля, 1729) псіхалагічна глыбока ўвасабляюць вобразы духоўнага хараства, пакут і велічы чалавека. Інтанацыйным багаццем вызначаецца мелас Б., які вырас на аснове пратэстанцкага харала і ідзе ўглыб ням. песеннасці. Усеабдымнай муз. формай і найпершым метадам тэматычнага развіцця стала для Б. фуга. Стварыўшы больш за 400 фуг, надаў гэтай форме рысы класічнай дасканаласці. Вялікія дасягненні Б. ў рытміцы; на аснове дыятонікі і развітага мажора-мінора склалася яго ладава-гарманічнае мысленне. Завяршыўшы доўгі перыяд пошукаў у галіне тэмперацыі, Б. адкрыў шлях да імклівага развіцця сучаснай гармоніі.

Чатыры сыны Б. былі музыкантамі. Найбольш вядомы сярод іх — кампазітар і клавесініст Карл Філіп Эмануэль (1714—88). У сваёй клавірнай творчасці ён выпрацаваў новы выразны стыль, блізкі да эстэтыкі ням. літ. плыні «Вура і націск».

Тв. Баха І. С.: Пасіі па Іаане (1723), Магніфікат (1723?), араторыя (1734), 24 свецкія кантаты, каля 300 духоўн. кантат, матэты, духоўн. песні, харалы; для органа — 145 харалаў і харальных прэлюдый, пасакалья і інш.; для клавіра — Добра тэмпераваны клавір (у 2 тамах, 1722, 1744; у кожным томе 24 прэлюдыі і фугі ва ўсіх мажорных і мінорных танальнасцях), 6 англ. сюіт, 6 французскіх сюіт, 6 партыт, інвенцыі і. інш.; п'есы для скрыпкі, віяланчэлі, флейты, віёлы да гамба і інш.

Літ.: Ливанова Т. Музыкальная драматургия И. С. Баха и её исторические связи, М.—Л., 1948; Хубов Г. Н. Себастьян Бах, 4 изд., М., 1963; Этингер М. А. Гармония Баха, М., 1963; Швейцер А. Иоганн Себастьян Бах, [пер. з нем.], М., 1964; Spitta P. Johaann Sebastian Bach, Wiesbaden, 1961. *Т. А. Шчарбакова.* Мінск.

БАХАНЫ, вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Беседзь. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны маяк». За 12 *км* на ПдЗ ад Хоцімска, 200 *км* ад Магілёва, 33 *км* ад чыг. ст. Камунары, на шашы Хоцімск—Касцюковічы. 967 ж., двароў 307 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, швейная майстэрня. У 1905 у Б. адбылося выступленне сялян супраць мясцовага пана, якое было жорстка задушана. З абеліскі 149 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. На беразе р. Беседзь курганы часоў Кіеўскай Русі.

БАХАНЬ, вёска ў Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Суворава. За 27 *км* на ПдЗ ад Слаўгарада, 75 *км* ад Магілёва, 42 *км* ад чыг. ст. Быхаў. 689 ж., двароў 212 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, магазін.



БАХАРАЎ Барыс Сяргеевіч (10.9.1902, г. Дзямянск Наўгародскай губ.— 16.7.1944), савецкі ваенны дзеяч, ген.-м. танкавых войск. Чл. КПСС з 1924. З 19 гадоў у Чырв. Арміі. Скончыў акадэмію імя Фрунзе (1932), служыў у Бабруйску. У Айч. вайну ўдзельнічаў у баях за вызваленне Украіны і Беларусі, камандаваў танкавай дывізіяй і 9-м танкавым корпусам, якому за вызваленне Бабруйска (29.6.1944) прысвоена найменне Бабруйскага Чырванасцяжнага. Загінуў пры вызваленні Беларусі, пахаваны ў Бабруйску. На магіле Б. пастаўлены помнік — танк Т-34. Імем Б. названы цэнтр. гарадскі сквер і вуліца ў Бабруйску. Узнаг. 5 ордэнамі, медалямі. *У. П. Церашчук.* Бабруйск.

БАХЕНСКІ (Bocheński) Юзаф Марыя (н. 30.8.1902, Польшча), рэакцыйны каталіцкі філосаф. Прафесар логікі і метадалогіі навукі Фрэйбургскага ун-та ў Швейцарыі (з 1945), кіраўнік т. зв. «Усходнееўрапейскага інстытута» (з 1958), створанага на сродкі Ракфелераўскага фонду для барацьбы супраць камуніст. ідэалогіі. Вядомы як фальсіфікатар марксізма-ленінізма.

БАХМАН (Bachmann) Інгебарг (н. 25.6. 1926, Клагенфурт), аўстрыйская пісьменніца. Зборнікі вершаў «Адтэрмінаваны час» (1953), «Ключ Вялікай Мядзведзіцы» (1956) напісаны ў сімвалічнай манеры пад уплывам Т. С. Эліята і Р. М. Рыльке. Паэзія, навелы (зб. «Трыццаты год», 1961), драмы «Цыкады» (1955), «Добры бог з Манхэтэна» (1958), раман «Горад без імя» вызначаюцца багаццем мовы, музыкальнасцю, вытанчанасцю формы. Тэма творчасці — бяздушнасць сучаснай бурж. цывілізацыі, адзіноцтва і раз'яднанасць людзей у капіталіст. свеце.

БАХМАН (Bachmann) Курт (н. 23.6.1909), дзеяч герм. рабочага руху. Па прафесіі сартавальнік скур. З 1932 камуніст. З прыходам да ўлады фашыстаў працаваў нелегальна ў Кёльне. У 1938 эмігрыраваў у Францыю, там удзельнічаў у антыфаш. барацьбе. У 1942 арыштаваны, выдадзены гестапа, якое пасадзіла яго ў канцэнтрацыйны лагер. Пасля разгрому гітлераўскай Германіі адзін з заснавальнікаў Аб'яднання асоб, што праследаваліся пры нацызме, журналіст. З 1950 супрацоўнік Праўлення кампартыі Германіі (забаронена ў 1956). У вер. 1968 выступіў з ініцыятывай стварэння Германскай камуніст. партыі (ГКП). На І з'ездзе ГКП (12—13.4. 1969) выбраны старшынёй партыі.

БАХМАТОВІЧ Казімір (1808—1837), графік і жывапісец. Жыў і памёр у Дабраўлянах каля Смаргоні. Вучыўся ў Віленскім ун-це (1823—27) у Я. Рустэма, потым выкладаў рысаванне ў прыватных дамах. Вядомы рэаліст. бытавыя зарысоўкі, пейзажы, гравюры, зробленыя Б. у Вільні і Дабраўлянах, карціны («Чэркес па кані», «Жабрак»), альбомы літаграфій («Успаміны пра Дабраўляны», 1835; «Касцюмы і сцэны», 1837). Творы Б. маюць і этнагр. вартасць.

БАХМЕЦЬЕЎ Іван Андрыянавіч [н. 18(31). 10.1917, с. Нікольскае-па-Яманчы Ніжнедзябаўскага пав. Варонежскай губ.], удзельнік Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1935. Удзельнік баёў з японцамі на воз. Хасан (1938). На франтах Айч. вайны з крас. 1942: на Зах., Цэнтр., Бел. і



К. Бахматовіч.
Рыс. з альбома «Касцюмы і сцэны». 1837.

1-м Бел. франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. і Сажа на Пд ад Гомеля. У 1945 удзельнічаў у разгроме яп. Квантунскай арміі. У 1947 скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе, у 1958 — акадэмію Ген. штаба. Служыць у Сав. Арміі.

БАХМЕЦЬЕЎ Уладзімір Мацвеевіч [2(14).8. 1885, г. Зямлянск Варонежскай губ.— 16.10. 1963], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1909. З юнацтва ўдзельнічаў у рэвалюц. руху. Выступіў у друку (1905) як журналіст, з маст. творамі — у 1910. У аповесцях, нарысах і апавяданнях паказвае жыццё сібірскага сялянства і рэвалюц. абуджэнне народа («Нядзеля», 1910; «Сухі патоп», 1914; «Алёна», 1915; «Маці», 1916), гераізм рэвалюцыянераў, сутыкненне новага і старога ў свядомасці людзей («Памылка», 1924; «Жалезная трава», 1926; «Цень у полымі», 1929). Самы значны твор Б. з эпохі грамадз. вайны ў Сібіры — раман «Злачынства Марціна» (1928). У Айч. вайну пісаў апавяданні пра мужнасць сав. салдатаў.

Тв.: Избр. произв., т. 1—2, М., 1957; Вячеслав Шишков. Жизнь и творчество, М., 1947.

БАХРЭЙН (Bahrain), Бахрэйнскія астравы, група астравоў у паўд. частцы Персідскага заліва, каля ўзбярэжжа Саудаўскай Аравіі і Катара, пратэктарат Вялікабрытаніі. На а-вы прэтэндуе Іран, які лічыць іх сваёю правінцыяй.

Пл. 598 км², нас. 200 тыс. чал. (1968), пераважна арабы. Адм. ц. Манама. А-вы мацерыковага паходжання, часткова каралавыя. Найб. выш. 135 *м* над узр. м. Клімат трапічнага пояса, гарачы, сухі, ападкаў каля 100 *мм* за год. Здабыча нафты (3,7 млн. *т*, 1966) амерыканскай кампаніяй. У Манаме з-д (магутн. каля 14 млн. *т* у год), ён перапрацоўвае нафту мясцовую і што паступае з Саудаўскай Аравіі па нафтаправодзе. Вырошчваюць фінікавую пальму, вінаград, цытрусавыя. Здабыча жэмчугу і губак, рыбная лоўля. Рамонт суднаў. На в-ве Махерэк міжнар. аэрапорт. Ваен. базы Вялікабрытаніі.

БАХУС (грэч. Bakchos, лац. Bacchus), Бакх, у старажытнарымскай міфалогіі бог вінаградарства і вінаробства. У міфалогіі стараж. грэкаў яму адпавядае *Дыяніс*.

БАХЧАВОДСТВА, галіна раслінаводства,

вырошчванне раслін сямейства гарбузовых (кавуноў, дыняў, гарбузоў). У Расіі ўзнікла ў сярэдзіне 19 ст. У СССР пашырана на Украіне, у Ніжнім Паволжы, Сярэдняй Азіі. Плады бахчавых культур спажываюць у ежу. Добры корм жывёле. З насення робяць алей. Бахчавыя расліны цеплалюбныя, патрабуюць урадлівай глебы. Па плошчы бахчавых культур СССР займае 1-е месца ў свеце (больш за 1,5 млн. *га*). У СССР раяніравана сартоў (1966): дыняў 101, кавуноў 46, гарбузоў 21. У БССР выспяваюць: дыні Калгасніца, Алтайская, Грунт, Грыбаўская, Куставая 11; кавуны Стокс, Сквірскі скараспелы 10, Харкаўскі скараспелы, Улюбёнец хутара Пяцігорска; гарбузы Вітамінны, Высокакаранінны, Мускатны, Кашгарскі, Мазалееўскі, Зімовы міндальны; кабачкі Грэчаскі, Грыбаўскі; патысоны Белы 13, Крукнекі. Сярэдні ўраджай дыняў 6—9, кавуноў 10—30, гарбузоў да 150 *ц/га*.

Літ.: Лучшие сорта овощных, бахчевых культур и картофеля (Каталог). М., 1967; Марков В. М. Овощеводство, М., 1966; Герасимов В. А. и Осницкая Е. А. Вредители и болезни овощных культур, 4 изд.. М., 1961.

А. Н. Купрэева. Мінск.

БАЦВІНАВА, вёска ў Меркулавіцкім с/с Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Бацвінава». За 18 *км* на ПнЗ ад Чачэрска, 63 *км* ад Гомеля, 31 *км* ад чыг. ст. Буда-Кашалёва. 522 ж., двароў 162 (1970). Васьмігадовая школа, аддз. сувязі, магазін. Каля Б. стараж.-славянскія курганы 9—11 ст.

БАЦВІНАЎКА, вёска ў Крычаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Жукаўка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Звязда». За 22 *км* на ПнЗ ад Крычава, 80 *км* ад Магілёва, 1 *км* ад чыг. ст. Асавец. 495 ж., двароў 144 (1970). Пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аптэка, аддз. сувязі, 4 магазіны. Помнік сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

БАЦВІННІК Міхаіл Майсеевіч [н. 4(17).8. 1911, Пецярбург], савецкі шахматыст, вучоны ў галіне энергетыкі. Д-р тэхн. н. (1951). Чл. КПСС з 1940. Чэмпіён свету 1948—57, 1958—60 і 1961—63. Сем разоў быў чэмпіёнам СССР. Гросмайстар з 1935. Наватар шахматнай школы і аўтар многіх кніг па шахматах. Узнаг. ордэнамі Леніна, Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Избранные партии. 1926—1946, 2 изд., М., 1951; Советская шахматная школа, М., 1951; Алгоритм игры в шахматы, М., 1968.
Літ.: Шахматное творчество Ботвинника, т. 1—3, М., 1965—68.

БАЦІН Мікалай Арсенавіч [н. 8(21).3.1911, с. Юркіна Шуйскага пав. Валагодскай губ.], бел. сав. вучоны ў галіне механічнай тэхналогіі драўніны. Д-р тэхн. н. (1966), праф. (1966). Чл. КПСС з 1943. Прарэктар Беларускага тэхналаг. ін-та імя Кірава (1949—55 і з 1961). Заг. кафедры лесапілавання і правектавання дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў таго самага ін-та. Працы па тэорыі і практыцы рацыянальнага раскрою пілаванай сыравіны і вытворчасці піламатэрыялаў. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: (Разам з В. А. Біруковым і Л. А. Манкевічам) Справочник по деревообработке, Мн., 1958.

БАЦІЦКІ Павел Фёдаравіч [н. 14(27).6. 1910, Харкаў], савецкі ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1968). Герой Сав. Саюза (1965). З рабочых. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Ленінградскую кав. школу (1929), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1938), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1948). У 1938—40 у Ген. штабе Чырв. Арміі. З снеж. 1940 нач. штаба брыгады, з сак. 1941 — дывізіі. З чэрв. 1941 да ліп. 1943 нач. штаба, камандзір дывізіі на Паўн.-Зах. фронце; з ліп. 1943 да мая 1945 камандзір стралковага корпуса на Варонежскім, потым Сцяпным, 1-м і 2-м Укр., 1-м і 3-м Бел. франтах. Удзельнічаў у вызваленні Украіны, Малдавіі, Беларусі, у разгроме ворага ва Усх. Прусіі, у штурме Берліна, вызваленні Прагі. Пасля вайны камандаваў корпусам. У 1948—54 нач. Галоўнага штаба ВПС, першы нам. камандуючага войск ваен. акругі, камандуючы ваеннымі злучэннямі; у 1954—65 камандуючы войск Маскоўскай акругі ППА; у 1965—66 першы нам. начальніка Ген. штаба Паветраных Сіл. З ліп. 1966 Галоўнакамандуючы войск ППА краіны, нам. міністра абароны СССР. На XXII з'ездзе КПСС выбраўся канд. у чл. ЦК, на XXIII — чл. ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 6—8-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 8 інш. ордэнамі, медалямі.



БАЦІШЧАЎ Самуіл Ільіч [8(20).8.1897, в. Судбішчы Арлоўскай губ.— 20.10.1959], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1929. Напярэдадні вайны працаваў дырэктарам абл. канторы Дзяржбанка ў Мазыры. З мая 1942 у апараце ЦК КП(б)Б, потым накіраваны ў тыл ворага. З сак. 1943 камісар *партызанскай брыгады № 123* імя 25 гадоў БССР Палескага злучэння. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

БАЦКІ ВЕК (ЯРУС), апошні век сярэднеюрскай эпохі *юрскага перыяду* (трэці знізу ярус сярэднеюрскага аддзела юрскай сістэмы). Вылучаны бельг. геолагам Амаліусам д'Алуа ў 1843. Назва ад г. Бату ў Англіі. На Беларусі адклады Б. я. магутнасцю да 60 *м* пашыраны на Пд і ПдУ. Узрост іх вызначаны па комплексе споравых і пылку і па аналогіі з аднатыпнымі адкладамі прылеглай ч. Дняпроўска-Данецкай упадзіны. У разрэзе Б. я. адклады кантынентальна-прыбярэжных фацый — перамежаванне пяваністых глінаў, тонкаслаістых і слюдзістых алеўрытаў, часта вельмі вуглістых, з праслоямі і лінзамі бурага вугалю.

БАЦУНЬ, вёска ў Івольскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны шлях». За 25 *км* на Пд ад Буда-Кашалёва, 40 *км* ад Гомеля, 17 *км* ад чыг. ст. Уза. 771 ж., двароў 262 (1970).

Сепаратарны пункт, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БАЦЫЛАНОСЬБІЦТВА (мікробаносьбіцтва), наяўнасць у арганізме чалавека і жывёл узбуджальнікаў інфекцыйных хвароб (без клінічных сімптомаў) і выдзяленне іх у навакольнае асяроддзе. Бывае ў здаровых людзей і перахварэлых на інфекцыйныя хваробы. Дыягностыка Б. заснавана на бактэрыял., вірусалагічным або паразіталагічным абследаванні носьбіта і метадзе эпідэміялагічнага абследавання. Б. спрыяюць хранічнае запаленне глотачных міндалін, жоўцевага пузыра, слізістай абалонкі тоўстых кішак. Апісана Б. брушнога тыфу, паратыфаў, халеры, дызентэрыі, хваробы Боткіна, менінгіту, поліяміэліту. Асабліва небяспечнае сярод работнікаў харч. прадпрыемстваў і водазабеспячэння, дзіцячых і лячэбных устаноў. Прафілактыка: шпіталізацыя хворых, перад выпіскай з бальніцы пасля інфекцыйных хвароб абавязкова праверка на Б., сістэматычнае абследаванне работнікаў водазабеспячэння і харч. прадпрыемстваў, дзіцячых і лячэбных устаноў, абавязковае выкананне бацыланосьбітамі правілаў асабістай гігіены, абеззараджванне іх рэчаў і выдзяленняў. Лячэнне: аздараўленне насаглоткі, жоўцевага пузыра, тоўстага кішэчніка; антыбіётыкі, сульфаніламіды, *бактэрыяфаг*.

Л. М. Гаршанава. Мінск.

БАЦЫЛЫ (лац. bacillum палачка), палачкападобныя бактэрыі, у цыкл развіцця якіх уваходзіць спараўтварэнне. Да Б. належаць глебавыя сапрафіты (сенная, капусная, бульбяная палачкі і інш.), многія патагенныя бактэрыі (узбуджальнік сібірскай язвы, слупняку і інш.). Споры ў Б. утвараюцца ад дзеяння адмоўных фактараў (недастатковасці жыўлення, вільгаці і г. д.) і з'яўляюцца прыстасаваннем для захавання жыцця. Многія Б. ўдзельнічаюць у працэсах мінералізацыі арган. рэчываў глебы.

«БАЦЬКАЎШЧЫНА», аб'яднанне беларускай буржуазна-нацыяналіст. інтэлігенцыі з мэтай распаўсюджання нацыяналіст. ідэй над выглядам культурна-асветнай дзейнасці. Створана ў Мінску ў жн. 1918 ва ўмовах акупацыі Беларусі нямецкімі захопнікамі. Арганізатары: І. Варонка, К. Езавітаў, П. Крачэўскі, Ю. Гадыцкі-Цвірко, Е. Бялевіч, Я. *Лёсік* і інш. Разам з Радай *Беларускай народнай рэспублікі* выдавалі бурж.-нацыяналіст. газеты («Беларусь», «Беларускае слова», «Беларуская думка», «Незалежная думка» і інш.), часопісы («Бацькаўшчына», «Часопісь»), лістоўкі і брашуры, у якіх паклёпнічалі на бальшавікоў, заклікалі да барацьбы супраць Сав. улады. Аддзяленні «Б.» былі ў Бабруйску, Гродне, Рызе, Вільні і некаторых павятовых гарадах Беларусі. Пасля выгнання польскіх інтэрвентаў з Беларусі (лета 1920) «Б.» і яе аддзяленні распаліся.

М. С. Сташкевіч. Мінск.

«БАЦЬКАЎШЧЫНА», газета, орган Рады т. зв. Беларускай Народнай Рэспублікі — антысавецкага цэнтра, створанага разведвальнымі органамі амерыканскай сакрэтнай службы з бел. бурж. нацыяналістаў, паслугачоў ням.-фаш. захопнікаў у час Айч. вайны, якія знаходзяцца за межамі СССР. Выдавалася ў 1947—66 у Мюнхене. Вяла паклёпніцкую прапаганду супраць Сав. Беларусі. Закрыта з-за адсутнасці падпісчыкаў.

Д. М. Савіцкі. Мінск.

БАЦЬКОЎСКІЯ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ, сукупнасць юрыдычных нормаў, якія рэгулююць выхаванне і ўтрыманне дзяцей бацькамі. Прадугледжаны і гарантуюцца сав. заканадаўствам не толькі ў інтарэсах дзяцей, але і ў інтарэсах бацькоў. Гэтыя правы і абавязкі захоўваюцца за бацькамі да паўналецця дзяцей. Гал. абавязкі бацькоў: выхаванне дзяцей у духу маральнага кодэкса будаўніка камунізма, клопаты пра іх фізічнае развіццё, навучанне і падрыхтоўку да грамадска карыснай дзейнасці. Усе меры для выхавання дзяцей бацькі прымаюць з узаемнай згоды. Калі такой згоды няма, пытанне вырашаецца органамі апекі з удзелам бацькоў. Калі бацькі не жывуць разам, ад іх узаемнай згоды залежыць таксама, хто будзе выхоўваць непаўналетніх дзяцей. У выпадках, калі такой згоды дасягнуць не ўдаецца, пытанне вырашае нар. суд. Суд выходзіць перш-наперш з інтарэсаў дзяцей, улічваючы пажаданні бацькоў, умовы жыцця кожнага з іх, пол, узрост дзяцей, іх асабістую прыхільнасць да бацькі ці маці і інш. акалічнасці.

Бацькі маюць права патрабаваць праз суд сваіх непаўналетніх дзяцей ад інш. асоб, якія трымаюць іх у сябе на незаконнай падставе. Такімі асобамі могуць быць родныя (цётка, дзядзька або дзед дзяцей) і чужыя. Суды выносяць рашэнні на карысць трэціх асоб толькі тады, калі перадача дзіцяці бацькам не адпавядае яго інтарэсам. Для разгляду справы пра тое, хто будзе выхоўваць дзяцей, неабходна абавязкова абследаваць умовы, у якіх дзіця жыве і ў якія яно трапіць, калі іск будзе задаволены (абследаванне праводзіць прадстаўнік органа апекі). Той з бацькоў, які не выхоўвае дзіцяці, мае права сустракацца з ім. Сустрэчы могуць быць забаронены, калі яны адмоўна ўплываюць на дзіця. За наўмыснае парушэнне бацькоўскіх правоў і невыкананне абавязкаў па выхаванні дзяцей бацькі пазбаўляюцца бацькоўскіх правоў. У выпадку, калі бацькі не забяспечваюць належнага нагляду за дзецьмі, але робяць гэта без віны (напр., пры псіхічнай хваробе) або калі іх віна не вельмі вялікая, рашэннем суда дзіця можа быць адабрана ў бацькоў без пазбаўлення іх бацькоўскіх правоў. Дзіця перадаецца органам апекі, а з бацькоў спаганяюцца *аліменты*. Бацькі могуць зноў атрымаць свае правы толькі ў выпадках, калі пазбавіліся сваіх адмоўных звычак, працягламі добрасумленнымі паводзінамі даказалі, што ім можна даручыць гэтыя правы і абавязкі. Гл. таксама *Кодэкс аб шлюбе і сям'і БССР*.

Літ.: Юрашкевич А. И. Правовые вопросы воспитания детей, «Ученые записки Белорусского юридического ин-та», 1940, в. 1; Ильинская И. М. Судебное рассмотрение споров о праве на воспитание детей, М., 1960; Свердлов Г. Заметки о родительском праве, «Социалистическая законность», 1965, № 6.

М. Р. Юркевіч. Мінск.

БАЦЭВІЧЫ, вёска ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Ольса (прыток Бярэзіны). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 15 *км* на ПдЗ ад Клічава, 114 *км* ад Магілёва, 16 *км* ад чыг. ст. Тачанка, на шашы

Бабруйск — Клічаў. 1315 ж., двароў 408 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання, аб'яднанне Сельгастэхнікі, цагельня, сепаратарны пункт. Сярэд. і пач. школы, дзіцячы сад, яслі, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. У 1905 існавала с.-д. група. Помнік савецкім воінам, якія загінулі ў Айчынную вайну.

БАЦЮНЯ Аляксандр Рыгоравіч [н. 20.6 (2.7).1898, в. Курганы Бабруйскага пав. Мінскай губ.], савецкі ваенны дзеяч, генерал-палкоўнік (1958). З сялян. Чл. КПСС з 1929. З 1916 у царскай арміі. У чэрв. 1917 удзельнічаў у баях супраць немцаў каля Баранавіч. У ліст. 1918 добраахвотна пайшоў у Чырв. Армію. У грамадз. вайну змагаўся супраць белапалякаў і бандаў Булак-Балаховіча. Скончыў Вышэйшыя стралкова-тактычныя курсы ў Смаленску (1921), Акадэмію імя Фрунзе (1934).



Удзельнічаў у баях з яп. захопнікамі каля воз. Хасан (1938). У Айч. вайну нач. штаба корпуса, потым — арміі ў складзе Паўд., Паўд.-Зах., Варонежскага, 1-га Укр. франтоў, на Курска-Арлоўскай дузе. Вызваляў Сумы, Пераяслаў-Хмяльніцкі, Кіеў, Жытомір, Вінніцу, Камянец-Падольскі, Чэхаславакію. З 30.5. 1946 нач. штаба Зах.-Сібірскай ваен. акругі. У ліст. 1951 — сак. 1961 нач. штаба Паўн.-Каўказскай ваен. акругі. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 8 інш. ордэнамі, медалямі, 2 ордэнамі замеж. краін. Жыве ў Растове-на-Доне.

БАЧАНКОЎ Іван Андрэевіч [н. 5(18).8.1908, в. Чорны Луг Невельскага пав. Віцебскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1942. На фронце з ліп. 1941. Вызначыўся 15—16.10.1943 пры фарсіраванні Дняпра на Пн ад Лоева Гомельскай вобл. (пад варожым агнём пераправіў на пантоне 350 чал. пяхоты, мінамётную роту і батарэю палкавой артылерыі) і ў ліст. 1943 пры фарсіраванні Сажа каля в. Нова-Церашковічы на Пн ад Гомеля. Жыве ў Пскоўскай вобл.

БАЧНАСЦЬ, *уяўнасць* (*у філасофіі*), непасрэднае, пачуццёвае ўспрыманне чалавекам з'яў прыроды і грамадства. Мае аб'ектыўную аснову ў сутнасці, але звычайна не адпавядае ёй, бо адлюстроўвае тое, што ляжыць на паверхні, што бачна вонкава. Напр., заработная плата, якую выплачвае капіталіст рабочаму, уяўна можа ўспрымацца як аплата ўсёй працы рабочага, але ў сапраўднасці яна аплачвае толькі частку працы, тады як другая яе частка з'яўляецца крыніцай прыбытку капіталіста. Пазнанне ніколі не спыняецца на Б., а ідзе далей, каб праз Б. выяўляць аб'ектыўную сутнасць рэчаў (гл. *З'ява і сутнасць*); яна ахоплівае пачуццёвую і рацыянальную ступені і мае ў сваёй аснове грамадска-гістар. практыку.

БАЧНАСЦЬ АТМАСФЕРНАЯ, магчымасць адрозніваць аддаленыя аб'екты, аддзеленыя паветрам ад назіральніка. Вывучаецца *атмасфернай оптыкай*. Характарызуецца далёкасцю Б. а.— гранічнай адлегласцю, на якой яшчэ відаць аб'ект. Далёкасць Б. а. залежыць ад асвятлення, аптычных параметраў атмасферы, уласцівасцей эроку, геаметрычных і фотаметрычных характарыстык аб'екта і яго фону.

Б. а. аб'ектаў, якія самі не свецяцца, вызначаецца бачным кантрастам K аб'екта з фонам

$$K = \frac{B_а - B_ф}{B_а} \quad (\text{калі } B_а > B_ф) \text{ ці } K = \frac{B_ф - B_а}{B_ф}$$

(калі $B_ф > B_а$), дзе $B_а$ і $B_ф$ яркасці аб'екта і фону.

Б. а. аб'ектаў, якія самі не свецяцца, пагаршаецца аслабленнем у атмасферы патоку святла ад аб'екта і фону і накладаннем на яркасць аб'екта і фону яркасці рассеянага ў паветры святла (атмасферная смуга). Магчымасць распазнавання крыніц святла вызначаецца асветленасцю E, створанай імі на зрэнцы вока. Напр., калі $E > 2 \cdot 10^{-7}$ лк, агонь бачны. Рассеянне светлавога патоку ў атмасферы прыводзіць да памяншэння E і бачнасці.

Мае практычнае значэнне для транспарту (Б. а. пуцявых знакаў і пасадачных пляцовак), тапаграфіі (Б. а. трыянгуляцыйных знакаў), аэрафотаздымкі і вайсковай справы.

Літ.: Гаврилов В. А. Видимость в атмосфере, Л., 1966; Шаронов В. Видимость далеких предметов и огней, М.—Л., 1944.

М. А. Гольберг. Мінск.

БАЧЫЛА Алесь (Аляксандр Мікалаевіч; н. 2.3.1918, в. Лешніца Ігуменскага пав. Мінскай губ.), беларускі савецкі паэт. Засл. дз. культ. БССР (1967).



Чл. КПСС з 1942. З сялян. Скончыў Мінскі педтэхнікум (1934), завочна Мінскі наст. ін-т (1939). Настаўнічаў (1934—39). У арміі з 1939 да 1945, удзельнік Айч. вайны. У 1946—57 заг. аддзела, адказны сакратар, нам. галоўнага рэдактара газ. «Літаратура і мастацтва». З 1957 адказны сакратар час. «Полымя». Друкуецца з 1934. Першы зб. «Шляхі» (1947). Распрацоўвае патрыят. тэматыку, многа ўвагі аддае маральна-этычным праблемам. Піша лірычныя і сатыр. вершы, паэмы, оперныя лібрэта. Многія тэксты паэта пакладзены на музыку. Шырока вядома яго песня «Радзіма мая дарагая» (муз. У. Алоўнікава). Па лібрэта Б. пастаўлены оперы «Яснае світанне» (муз. А. Турапкова), «Калючая ружа» і «Калі ападае лісце» (муз. Ю. Семянякі). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Подых вясны, Мн., 1950; Зоры вясенніе, Мн., 1954; Яснае світанне, Мн., 1958; Юнацтва, Мн., 1959; Калючая ружа, Мн., 1962; Дарыце цюльпаны, Мн., 1966; Кавалер Мікіта, Мн., 1967; Снежная балада, Мн., 1968; Падарожжа па снежках жыцця, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.


М. М. Барсток. Мінск.


БАЧЫЛА Фёдар Апанасавіч (н. 21.1.1924, в. Бардзілаўка Мінскага пав.), удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну, кіраўнік дыверсійнай групы, якая падарвала 28 варожых эшалонаў. З рабочых. Чл. КПСС з 1951. Працаваў на будаўніцтве ў Мінску. З ліп. 1941 да кастр. 1942 сувязны Мінскага парт. падполля і партыз. атрада імя Варашылава, з кастр. 1942 да крас. 1944 камандзір дыверсійнага ўзвода 3-й Мінскай партыз. брыгады. У 1945—46 камсорг ЦК ВЛКСМ, слухач Рэсп. парт. школы пры ЦК КП(б)Б. З 1948 у газ. «Чырвоная змена». Узнаг. ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

БАЧЭЙКАВА, вёска ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Бачэйкава». Прыстань на р. Ула. За 21 *км* на ПнЗ ад Бешанковіч, 75 *км* ад Віцебска, 21 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, на скрыжаванні шашэйных дарог Віцебск — Лепель і Чашнікі — г. п. Ула. 918 ж., двароў 238 (1970). Цагельня, 2 школы, з іх адна сярэдняя, Дом культуры, б-ка, аптэка.

БАШКІРСКАЯ АЎТАНОМНАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Башкірыя), у складзе РСФСР. Утворана 23.3. 1919. Размешчана ў межах Паўд. Урала, Прыўралля і часткова Заўралля. Пл. 143,6 тыс. *км*². Нас. 3819 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 53 раёны; 17 гарадоў, 38 гар. пасёлкаў. Сталіца Уфа. Канстытуцыя прынята 23.6.1937 X Надзвычайным з'ездам Саветаў Башк. АССР і зацверджана Вярх. Саветам РСФСР у 1940. Вышэйшы орган дзярж. улады — Вярх. Савет, які выбіраецца на 4 гады (1 дэп. ад 20 000 чал.), а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета. Выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады: раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы дэп. працоўных. Судовая сістэма: Вярх. суд Башк. АССР і раённыя нар. суды.

Прырода. Усх. частка Б. занята хрыбтамі Паўд. Урала выш. да 1640 *м* (г. Ямантау). На ПнУ Уфімскае плато выш. да 692 *м*, парэзанае глыбокімі ярамі і рачнымі далінамі. У цэнтр. частцы нізінная даліна р. Белай і яе прытокаў. На ПдЗ — Бугульмінска-Белебееўскае ўзвышша выш. да 420 *м*. Б. багатая на карысныя выкапні: нафту, газ, вугаль, жал. руду (Камарова-Зігазінская група), золата, медную руду, цынк, буд. матэрыялы. Клімат кантынентальны з умеранага цёплым, іншы раз з гарачым летам і суровай зімой. Сярэднегадавая т-ра паніжаецца з З на У. Сярэдняя т-ра студз. —15, ліп. 19 °С. Ападкаў 550—600 *мм* за год на ПнУ і 300—400 *мм* у стэпавых раёнах на Пд. Летам бываюць сухавеі і пылавыя буры, зімой бураны. Самая вялікая рака Белая (бас. Волгі) з прытокамі Сім, Уфа, Дзёма і рэкі Ік, Буй, на Пд Сакмара (бас. Урала). Шмат азёраў і сажалак. Пераважаюць чарназёмы. На Пн ад р. Белая глебы дзярнова-падзолістыя і шэрыя лясныя. У раёнах Урала горныя лясныя шэрыя, горныя чарназёмы і горна-


БАШКІРСКАЯ АССР
Маштаб 1:4 500 000
45 0 45 90км
СТЭРЛІТАМАК
САЛАВАТ
МАГНІТАГОРСК
Сакмара
Урал
Белая
Ула
Уфа
Сім
Ік
Буй
Дзёма
Бельбей
Ямантау
Ірэмель
Нугуш
Аскіна
Бірск
Кумертау
Ішымбай
Белорецк
Верхнеуральск
Учалы
Сібай
Кувандык
Абзаново
Дубенскі
Энергетык
Акцябрскае
Чекмагуш
Благавешчанск
Краснавішэрск
Нефтэкамск
Чышмы
Туймазы
Бакалы
Мелеуз
Баймак
Кіргіз-Мякі
Старабалтачэва
Краснахолмскі
Верхнеяркеева
Мішкіно
Краснаўфімск
Бальшаўсуыкінскае
Новабелакатай
Месягутава
Верх.Кіна
Сатка
Златаўст
Аша
Катаў-Іванаўск
Міньяр
Кропачэва
Кусінскі
Кунашакскі
Варненскае
Кіяліскае
Полевая
Кваркена
Акцябрскі
Краснаярскі
Ірыклінскае вдск.
Кандыкінскае
Мраково
Ермалаева
Старасубхангулава
Караідзельскі
Караідзель
Шарлык
Александраўка
Федаровка
Новажылрэка
Пятшанава
Шаранава
Урмантава
Кірэя-Мілкі
Старабашкава
Ішлінскі
Ішымбай
Акбарысава
Аскарава
Агалякава
Тубінскі
Кайбасскі
Ісянгулава
Элгазіна
Кіяліскае
Ніжнеяркеева
Ніжнеаўсуыкінскае
Ніжнеаўсуыкінскі
Ніжнеаўсуыкінскі
Ніжнеаўсуыкінскі



Уфа. Вуліца Пяцідзесяцігоддзя Кастрычніка.


лугавыя глебы. 40,2% тэр. пад лесам. На Пн і ПнУ хвойна-шыракалістыя лясы, якія на Пд пераходзяць у шыракалістыя. На Пд кавыльна-разнатраўныя стэпы.


Насельніцтва. Башкіры (22%), рускія, татары. Жывуць таксама чувашы, марыйцы, украінцы, мардва. Сярэдняя шчыльн. 26,6 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 48% (1970). Найбольшыя гарады (тыс. ж., 1970): Уфа (773), Стэрлітамак (185), Салават (114), Акцябрскі, Беларэцк, Ішымбай, Кумертау, Туймазы.

Гістарычны нарыс. Паводле археал. звестак тэрыторыя Б. засялялася з часоў верхняга палеаліту. Першае апісанне башкіраў пакінуў араб. падарожнік Ібн Фадлан (921). У 10—13 ст. башк. плямёны качавалі ў Прыўраллі ад Волгі да Табола; займаліся жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам; адбывалася разлажэнне родавых і пераход да феад. адносін. У 13 ст. башкіраў заваявалі мангола-татары і ўключылі ў *Залатую Арду*. З 2-й пал. 15 ст. Б. стала васалам Нагайскай Арды, Казанскага і Сібірскага ханстваў. Пасля разгрому *Казанскага ханства* большая ч. Б. прыняла рус. падданства (1557). Далучэнне Б. да Рус. дзяржавы, нягледзячы на нац.-калан. прыгнёт, мела прагрэс. значэнне. Яно спрыяла аб'яднанню башкіраў у адзіную народнасць (16 ст.), пераходу іх да аселасці, развіццю земляробства, пазбавіла іх ад міжусобных войнаў і набегаў суседніх народаў. Феад.-калан. прыгнёт, раскраданне башк. зямель рус. памешчыкамі і заводчыкамі ўздымалі башкіраў на паўстанні (1662—64, 1681—83, 1705—11, 1735—40, 1747, 1755). На чале з *Салаватам Юлаевым* башкіры ўдзельнічалі ў *Сялянскай вайне пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова* (1773—75). З 18 ст. ў Б. развіваецца горназаводская прамысл. У 1798 царскі ўрад абвясціў башкіраў ваен. саслоўем, а ў 1863 прыраўняў іх у правах да сельскіх жыхароў. У 1895—97 ва Уфе ўзніклі першыя марксісцкія гурткі. У 1900 Уфу двойчы (у лют. і чэрв.) наведаў У. І. Ленін і правёў нарады з ссыльнымі марксістамі. У 1903 створаны Уфімскі к-т РСДРП. У снеж. 1905 ва Уфе ўзнік Савет рабочых дэпутатаў. У зах. раёнах Б. Сав. ўлада ўстаноўлена ў канцы кастр. 1917. У грамадз. вайну атрады працоўных Б. з Чырв. Арміяй змагаліся супраць войск Дутава, Калчака, башк. нацыяналістаў. У сак. 1919 абвешчана Башк. АССР. У 1922 да Б. далучана б. Уфімская губ. За гады пяцігодак Б. стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай, узніклі нафтавая, маш.-буд., баксітавая, марганцавая прамысловасць. За гады Айч. вайны аб'ём прамысл. прадукцыі вырас у 3,3 раза, пабудавана 400 новых, размешчана каля 90 прадпр. з зах. раёнаў СССР, у т. л. Гомельскі паравозарамонтны з-д (Уфа). За гераізм на франтах Айч. вайны каля 250 воінам з Башк. АССР прысвоена званне Героя Сав. Саюза, 30 тыс. чал. узнаг. ордэнамі і медалямі. За вызваленне Мазыра і Сарнаў (студз. — сак. 1944) 16-я гвардз. Башк. кавалерыйская дывізія ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. У пасляваен. гады імкліва развіваецца нафтахімія. Аб'ём прамысл. прадукцыі на пач. 1969 перавысіў узровень 1919 у 388 разоў. Сваю прадукцыю Б. вывозіць у 67 краін. За поспехі ў развіцці нар. гасп. Башк. АССР узнаг. 2 ордэнамі Леніна (1935, 1957) і ордэнам Кастр. рэвалюцыі (1969).

Народная гаспадарка. У гасп. СССР Б. вылучаецца як буйны раён па здабычы і перапрацоўцы нафты. У 1968 здабыта 47 млн. *т* нафты і 2,7 млрд. *м*³ газу. Нафтапромыслы: Туймазінскі (г. Акцябрскі), Ішымбайскі, Шкапаўска-Белебееўскі і інш. Нафтаперапр. з-ды ва Уфе, Ішымбаі, Салаваце. Нафтаправоды: Туймазы — Уфа — Ангарск, Ішымбай — Уфа, Туймазы — Шкапава — Салават, Туймазы — Орск; будуюцца новыя. Газаправод Шкапава — Ішымбай — Магнітагорск і далей на У. Здабыча бурага вугалю (6,5 млн *т*, 1968) і меднай руды. Машынабудаванне спецыялізуецца на вытв. абсталявання для нафтаперапр. і здабываючай прамысл. (Беларэцкі з-д горна-нафтавага абсталявання, Салаватскі маш.-буд. з-д). Энергамашынабудаванне. Металургічная і металаапр. прамысл. (Беларэцкі металургічны камбінат, Тырлянскі лістапракатны з-д). Вытв. металарэзных станкоў (Стэрлітамак), электратэхн. вырабаў (Уфа), сталедрацяных вырабаў (Беларэцк). Хім. прамысл.: Стэрлітамакскі содавы з-д, нафтагазахімія, вытв. гумавых вырабаў, дубільнікаў і фарбаў (Уфа), сухая перагонка драўніны (Амзянскі з-д). Ва Уфе, Стэрлітамаку, Салаваце буйныя ЦЭЦ. На р. Уфа Паўлаўская ГЭС. Вытв. эл. энергіі 11 939 млн. *кВт·гадз* (1968). На базе мясцовых рэсурсаў развіта лясная і драваапр. прамысл. Лесапільні, вапалкавая (Уфа) і папяровая ф-кі. Вытв. буд. матэрыялаў. Гарбарна-абутковая вытв. (Уфа, Стэрлітамак), тэкст. (Уфімскі баваўняны камбінат, Ніжнетроіцкая суконная ф-ка). Млынавыя камбінаты, масларобчыя, спіртавыя і пладова-агародніннымя прадпр.; Уфімскі вітамінавы і цукровы з-ды і інш. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні збожжа і жывёлагадоўлі. У Б. 635 калгасаў і 106 саўгасаў (1970). Пасяўная пл. (у тыс. *га*, 1969) — 4326,7, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 2849,7, кармавымі 1171,9, бульбай 157,5, тэхн. культурамі 136. Каля 58% пасеваў збожжавых займае яравая пшаніца. Сеюць азімыя, кукурузу, з тэхн.— цукр. буракі (66,6 тыс. *га*, 1969), сланечнік (57,1 тыс. *га*), гарчыцу. Жывёлагадоўля малочна-мясная і мяса-шэрснага кірунку. У 1970 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 2013, у т. л. кароў 783,9; авечак і коз 2993,7, свіней 905,2. Даўж. чыг. 1199 *км* (1969). Электрыфікаваная чыг. Куйбышаў — Уфа — Чэлябінск, Масква — Ульянаўск, Уфа — Стэрлітамак — Кумертау — Цюльган. Даўж. шашэйных дарог 19 300 *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 9300 *км*. Суднаходства па Уфе і Белай.

Нафтаапаратурны цэх Салаватскага машынабудаўнічага завода.





Нова-Уфімскі нафтаперапрацоўчы завод.


Ахова здароўя. У 1968 было 275 бальнічных устаноў на 32 768 ложкаў, 507 амбулаторна-паліклінічных устаноў, 6367 урачоў усіх спецыяльнасцей, 23 204 чал. сярэдняга мед. персаналу. Кадры рыхтуюцца Башк. мед. ін-там, 10 мед. школамі. У Б. 28 санаторыяў, з іх 18 дзіцячых.

Культура. Да Кастр. рэв. 95% башкіраў былі непісьменныя. У 1914/15 навуч. г. ў агульнаадук. школах займалася 132,5 тыс. дзяцей, у сярэдніх спец. навуч. установах 0,9 тыс. чал. ВНУ не было. За гады Сав. улады ліквідавана непісьменнасць, замацавана ўсеагульнае абавязковае навучанне. У 1968/69 навуч. г. працавалі: 4507 агульнаадук. школ усіх відаў (868 193 вучні), 61 сярэдняя спец. навуч. ўстанова (60 035 навучэнцаў), *Башкірскі універсітэт* імя 40-годдзя Кастрычніка, тры педагагічныя, нафтавы, авіяцыйны, мед., с-г. ін-ты, ін-т мастацтваў (усяго ў ВНУ 39 141 студэнт). У рэспубліцы 7 музеяў, 1670 масавых б-к, 3020 клубных устаноў, 2768 кінаўстановак (1968). Тэлецэнтр. Н.-д. работу вядуць Башк. філіял АН СССР, больш за 20 НДІ і інш. навук. устаноў. У 1970 выпускалася 167 назваў газет, у т. л. 6 часопісаў. Респ. газеты: «Советская Башкирия», «Совет Башкортостаны» («Савецкая Башкірыя», на башк. мове), «Кызыл Тан» («Чырвонае світанне», на тат. мове). Башк. кніжнае выдавецтва, рэсп. радыё і тэлебачанне.

Башк. народ мае багаты фальклор (эпічныя паэмы, песні, кубаіры, легенды, казкі і г. д.). На шлях самаст. развіцця башк. л-ра стала пасля ўтварэння Башк. АССР. Была створана пісьменнасць, пачала складвацца літ. мова, з'явіўся перыяд. друк. Аптымізмам і пафасам сцвярджэння новага прасякнута башк. л-ра 20-х г., асабліва вершы і аповесці нар. паэта М. *Гафуры*. У 30-я г. паявіліся раманы пра грамадз. вайну і рэвалюцыю (А. Тагіраў, Д. Юлтый, І. Насыры), творы пра сацыялістычнае пераўтварэнні ў рэспубліцы. Барацьба за новага чалавека стала цэнтральнай тэмай апавяд. і аповесцей І. Насыры, Х. Даўлетшынай, А. Карная, паэм Г. Саляма, драм С. Міфтахава. У Айч. вайну напісаны вершы і паэмы высокага патрыят. гучання (М. *Карым*, Р. Нігматы, С. *Кудаш*, Х. Карым), нарысы пра герояў фронту і тылу. Пасля вайны створаны раманы пра калектывізацыю (С. Агіш, В. Бікбай) і рабочы клас (К. Мэргэн, А. Бікчэнтаеў), гістар. драмы («Салават» Б. Бікбая). Пра падзеі мінулага і сучаснасці напісаны драмы М. Карыма, І. Абдуліна, А. Мірзагітава, Н. Асанбаева; раманы Х. Гіляжава, А. Валеева, А. Бікчэнтаева, Д. Ісламава, Я. Хаматава; аповесці Н. Мусіна, З. Біішавай, Ф. Ісангулава. У сучаснай башк. паэзіі шырока вядомыя імёны нар. паэтаў М. Карыма, С. Кудаша, паэтаў Н. Наджмі, Х. Карыма, Х. Гіляжава, М. Сюндзюкле, Г. Рамазанава, М. Галі, Р. Гарыпава, А. Атнабаева, Р. Сафіна. Развіваецца крытыка і літ.-знаўства (А. Харысаў, К. Мэргэн, Г. Хусаінаў, М. Гайнулін). На башк. мову перакладзены творы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі і інш.; на бел.— аповесці А. Тагірава («Салдаты» і «Чырвонагвардзейцы»), А. Бікчэнтаева («Вялікі аркестр»), апавяд. і вершы башк. пісьменнікаў.

У Б. знойдзены наскальныя роспісы (Капава пячора на р. Белай, верхні палеаліт), кераміка, упрыгожанні (1-е тысячагоддзе да н. э.— 1-е тысячагоддзе н. э.). Звычайнае жыллё качэўнікаў-жывёлаводаў: разборная лямцавая юрта «тырма», зімовыя дамы з бярвення. З пранікненнем ісламу з'яўляюцца маўзалеі [Кэшэнэ, 13 ст. (?)], мячэці (с. Стара-Тушкірова, 17—18 ст., і інш.). У 16—18 ст. узнікаюць гарады (Стэрлітамак, Белебей, Бірск, Уфа). У сав. час будуюцца новыя (Салават,

Б. В. Дамашнікаў. Зіма на Ўкраіне. 1955.



Акцябрскі і інш.), ідзе рэканструкцыя старых. Сярод архітэктараў А. і В. Любарскія, С. Якшын, Р. Бегунц, І. Анціпаў і інш. Развіты традыц. віды нар. мастацтва: ткацтва, аплікацыя на суконным абутку, ціснение на скуры, гравіроўка па метале, вышыўка тамбурам з раслінными, рогападобнымі, S-падобнымі і інш. ўзорамі. Развіваецца выяўл. мастацтва (першы мастак-башкір К. Даўлеткільдзееў). Сярод жывапісцаў 40—60-х г. — Б. Дамашнікаў, А. Бурзянцаў, Р. Нурмухаметаў, А. Лутфулін; скульптараў — Т. Нячаева, Б. Фузееў, В. Марозава; графікаў — Р. Гумераў, Б. Палеха; тэатр. мастакоў — М. Арсланаў і інш. Ва Уфе адкрыты ў 1920 маст. музей (з 1954 імя Несцерава); маст. вучылішча (1926—56, зноў адкрыта ў 1960).



В. Г. Марозава. Партрэт Героя Савецкага Саюза Аляксандра Матросава. 1947.

Нар. вак. музыка башкіраў аднагалосая. Адрозніваюцца узун-кюй — працяжныя ліра-эпічныя песні шырокага дыяпазону, разнастайныя па ладавай будове, часам багата арнаментаваныя, і кыска-кюй — хуткія танц. песні (іх разнавіднасць — танц. прыпеўкі такмакі). На змену чыста эпічнаму жанру кубаір (башк. былины) з канца 19 ст. прыйшоў баіт — баладныя песні пра актуальныя падзеі. Асобна стаяць песні і маршы пра Салавата Юлаева. Спецыфічны від нац. фальклору — уяляу — двухгалосыя спевы аднаго выканаўцы. Муз. інструменты: курай (від падоўжнай флейты) і кубыз (від варгана). Пачатак прафесіян. музыцы палажылі ў 20-я г. Х. Ібрагімаў, М. Валееў і інш. У 1938 ва Уфе адкрыты оперны т-р. У стварэнні нац. опер і балетаў удзельнічалі башк. кампазітары Валееў, Х. Заімаў, Р. Муртазін, З. Ісмагілаў, Х. Ахметаў, Н. Сабітаў і многія рус. (М. Пяйко, М. Чэмберджы, А. Эйхенвальд, Л. Сцяпанаў, А. Ключароў). Філармонія, 2 муз. вучылішчы.

У 1919 на базе чырвонаарм. самадзейных гурткоў быў створаны першы нац. калектыў — Башкірскі акад. т-р драмы. Спачатку ставіліся нац. фальклорныя і гісторыка-рэвалюц. п'есы М. Бурангулава, Д. Юлтыя і інш., а таксама тат. і рус. класічныя творы. Першы спектакль на сучасную тэму — «Чырвоная зорка» М. Гафуры (1926). У 1932 пастаўлена бел. п'еса «Гута» Р. Кобеца. Спектаклі апошніх гадоў: «Улада цемры» Л. Талстога, «Магамет» Вальтэра, «У ноч зацьмення месяца» М. Карыма. Працуюць 3 башк. драм., 2 рус. драм. і лялечны т-ры.

Літ.: Очерки по истории Башкирской АССР, т. 1 (ч. 1—2)—2, Уфа, 1956—66; Руденко С. И. Башкиры, М.—Л., 1955; Сайранов Х. С. Упрочение Советской власти в Башкирии (1919—1922 гг.), Уфа, 1957; Хисматов М. Ф. Башкирия. Экономико-географическая характеристика, Уфа, 1968; История башкирской советской литературы. Очерки, ч. 1—2, Уфа, 1963—66; Калимуллин В. Г. Архитектурные памятники Башкирии, в. 1—3, Уфа, 1956—58; Авижанская С. А., Бикбулатов Н. В. и Кузеев Р. Г. Декоративно-прикладное искусство башкир, Уфа, 1964; Лебединский Л. Н. Композиторы Башкирии, М., 1955; Ягжж. Башкирские народные песни и нангрыши, 2 изд., М., 1965; История советского драматического театра, т. 1—5, М., 1966—69; Волосович С. Художники Советской Башкирии, «Искусство», 1955, № 4.

А. С. Ахінчыц (прырода, гаспадарка), Мінск; *Х. Ш. Зінатуліна* (літаратура), *С. Нігмаджанава* (тэатр). Уфа; *Я. В. Баркгаўзен* (архітэктура, выяўленчае мастацтва). Масква.

БАШКІРСКАЯ МОВА, мова карэнных жыхароў Башкірскай АССР. У СССР яе лічаць роднай 610,2 тыс. чал. (1959, перапіс). З групы цюркскіх моў. Найбольшае сваяцтва з *татарскай мовай*, ад якой розніцца гал. ч. сістэмай зычных і лексікай. Асн. дыялекты: усходні (куваканскі) і паўднёвы (юрмацінскі). На іх аснове пасля ўтварэння Башк. АССР склалася сучасная башк. літ. мова. Пісьмо з 1939 на базе рус. графікі з 9 дадатковымі знакамі для абазначэння спецыфічных башк. гукаў.

Літ.: Дмитриев Н. К. Грамматика башкирского языка, М.—Л., 1948; Языки народов СССР, т. 2, М., 1966, с. 173—193.

БАШКІРСКІ ВЕК (ЯРУС), ранні век сярэднекаменнавугальнай эпохі *каменнавугальнага перыяду* (першы знізу ярус сярэднекаменнавугальнага аддзела кам.-вуг. сістэмы). Адклады Б. я. пашыраны ў СССР на Цянь-Шані, Украіне (Дняпроўска-Данецкая ўпадзіна), на зах. схіле Урала. На Беларусі выяўлены В. К. Галубцовым у 1955 на ПдУ Прыпяцкай упадзіны. Адклады Б. я. магутнасцю да 240 *м*, якія намнажаліся ва ўмовах мелкага мора, прыбярэжна-марскіх лагун і тарфяных балотаў, падзяляюцца на вапнякова-гліністую (ніжнюю) і глініста-пясчаную (верхнюю) тоўшчы. Ніжняя складзена з глінаў з праслоямі алеўралітаў, пясчанікаў, арганагенных і брэкчыяпадобных кавернозных вапнякоў, даламітаў і бурых вугалёў, верхняя — з пясчанікаў, алеўралітаў і глінаў з праслоямі вуглістых глінаў і вугалю (ад 0,1 да 1 *м*).

БАШКІРСКІ УНІВЕРСІТЭТ імя 40-годдзя Кастрычніка, заснаваны ў 1957 ва Уфе на базе Башкірскага пед. ін-та. Факультэты ў 1968/69 навуч. г.: фіз.-матэматычны, хімічны, біялагічны, геаграфічны, гістарычны, філалагічны, замежных моў. Вячэрняе і завочнае аддзяленні, аспірантура. Вучоныя ун-та вядуць даследаванні ў галіне геалогіі Паўд. Урала, геафізічных метадаў разведкі запасаў нафты, хіміі сераарганічных злучэнняў, башк. і тат. мовазнаўства і л-ры, фальклору, гісторыі Башкірыі.

«БАШМАК» (ням. Bundschuh), тайныя сялянскія саюзы ў Паўд.-Зах. Германіі ў 15 — пач. 16 ст., накіраваныя супраць феадальнага прыгнёту. Назву атрымалі ад нарысаванага чаравіка на сцягу саюзаў (рус. башмак). Пасля разгрому (1493) «Б.» ў Эльзасе ўзніклі новыя саюзы ў Шпэерскім епіскапстве (1502) і ў раёне Шварцвальда (1513, 1517). Патрабавалі падзелу царк. зямель, свабоднага карыстання абшчынными ўгоддзямі, адмены феад. павіннасцей і паборaў. Саюз «Б.» 1513 патрабаваў ліквідаваць усялякую ўладу, акрамя імператарскай, што было па сутнасці накіравана на пераадоленне дзярж. раздробленасці Германіі. Саюзы «Б.» вербавалі прыхільнікаў з розных апазіцыйных слаёў грамадства, каб потым падняць агульнае паўстанне супраць феадалаў і князёў. «Б.» адыграў вялікую ролю ў падрыхтоўцы *Сялянскай вайны 1524—25.*

БАШНІ, вёска ў Пагарэліцкім с/с Шумілінскага р-на Віцебскай вобл., на ўсх. беразе воз. Будавесць. Цэнтр калгаса імя Энгельса. За 10 *км* на ПдУ ад Шуміліна, 49 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Явіна. 203 ж., двароў 71 (1970). Пач. школа.

БАШЫРАЎ Гумер Башыравіч (н. 7.1.1901, в. Япасала каля г. Арска), татарскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1928. З сялян. Скончыў Ін-т марксізма-ленінізма ў Казані. Настаўнічаў. Удзельнік грамадз. вайны. Літ. дзейнасць пачаў у 1931 (апавяд. «Кроў Хашыма»). Аповесць «Сіваш» (1937) пра грамадз. вайну. У творчасці адчуваецца моцны ўплыў тат. фальклору, які Б. збіраў і даследаваў. Патрыят. апавяд. перыяду Айч. вайны ў зб. «Помста» (1942), «Гарманіст» (1943). Найб. значны твор — раман «Гонар» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1951), пра калгасную вёску ваен. часу. Дэп. Вярх. Савета СССР 4—5-га скл.

Тв.: Рус. пер.— Честь, Казань, 1966.

БАЯВАЯ АХОВА, адзін з відаў забеспячэння баявых дзеянняў войск. Мае на мэце папярэдзіць нечаканы напад праціўніка, не дапусціць пранікнення яго разведкі ў размяшчэнне войск, забяспечыць ім (у выпадку сутыкнення з праціўнікам) выгадныя ўмовы для ўступлення ў бой.

Б. а. ляцуць спец. прызначаныя падраздзяленні, склад і аддаленне якіх ад войск залежыць ад абставін і пастаўленай задачы. У наступальным баі Б. а. пасылаецца ад часцей першага эшалона, калі яны замацоўваюцца на занятых рубяжах, наперад і на адкрытыя флангі; у абарончым баі — ад батальёнаў першага эшалона (займае пазіцыю перад іх пярэднім краем). Пазіцыі Б. а. ўмацоўваюцца процітанкавымі і проціпяхотнымі загародамі, а баявыя дзеянні падтрымліваюцца агнём артылерыі і мінамётаў з гал. паласы абароны.

БАЯВАЯ ГАТОЎНАСЦЬ ВОЙСК, стан войск, паводле якога вызначаецца ступень іх гатоўнасці да выканання баявых задач. Асн. ўмовы пастаяннай Б. г. в.: укамплектаванне асабовым саставам, забеспячэнне ўзбраеннем, баявой тэхнікай, запасамі матэрыяльных сродкаў (боепрыпасамі, гаручым, харчаваннем), абучэнне спосабам сучаснага бою, баявая зладжанасць вайсковых злучэнняў, часцей (падраздзяленняў), дысцыплінаванасць і высокі палітыка-маральны стан асабовага саставу і інш. Б. г. в. залежыць таксама ад стану ваен. навукі, узроўню падрыхтоўкі генералаў, афіцэраў і штабоў, ад падрыхтаванасці тэатра ваен. дзеянняў, ведання верагоднага праціўніка.

БАЯВАЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА, сістэма мерапрыемстваў для навучання і выхавання асабовага саставу Савецкіх Узброеных Сіл. Баявая падрыхтоўка забяспечвае: набыццё ваеннаслужачымі ваен. тэарэт. ведаў і навыкаў баявых дзеянняў; баявую зладжанасць падраздзяленняў, часцей (караблёў) і злучэнняў. Праводзіцца на падставе загадаў міністра абароны, воінскіх статутаў, інструкцый, праграм баявой падрыхтоўкі. Аснова яе — палявая (марская, лётная) вывучка, найважнейшая частка якой — тактычная падрыхтоўка (навучанне

спосабам арганізацыі і вядзення бою). Паліт. падрыхтоўка мае на мэце фарміраваць у ваеннаслужачых марксісцка-ленінскі светапогляд, высокія маральна-баявыя і паліт. якасці, выхоўваць пільнасць, вернасць *ваеннай прысязе, баявым традыцыям* Сав. Узбр. Сіл, нязменную гатоўнасць абараняць Сав. Радзіму і інш. сацыяліст. краіны.

«БАЯВЫ», спецыяльны партызанскі атрад Наркамата дзяржаўнай бяспекі (НКДБ) БССР, які ў Айч. вайну змагаўся супраць акупантаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Створаны ў кастр. 1941 са спартсменаў-добраахвотнікаў. У сак. 1942 пераправіўся ў тыл ворага на лыжах (44 чал.). Камандзіры: А. С. Гарачоў, з 7.8.1942 В. Л. *Няклюдаў* (Герой Сав. Саюза, 1944). Дзейнічаў у Расонскім, Полацкім, Асвейскім, Ветрынскім р-нах Віцебскай вобл.; Мядзельскім, Докшыцкім, Ашмянскім р-нах Вілейскай вобл.; у паўд.-ўсх. раёнах Літ. ССР. У ходзе баявых дзеянняў значна папоўніўся мясцовым насельніцтвам. Партызаны атрада «Б.» пусцілі пад адхон 128 варожых эшалонаў, у т. л. 3 бронецягнікі; разбілі і пашкодзілі 102 паравозы, 1058 вагонаў і платформаў, 113 аўтамашын і матацыклаў; 8 танкаў, 4 бронемашыны, 1 самалёт; узарвалі і спалілі 78 масто ў, 16 складаў з боепрыпасамі і харчамі, разбурылі 9,5 *км* чыг. палатна, больш за 6 *км* тэлефоннай сувязі. 20.7.1944 атрад (674 чал.) злучыўся з часцямі Сав. Арміі.

І. С. Барысаў, П. І. Емяльянаў. Мінск.

БАЯВЫ ПАРАДАК, групоўка сіл і сродкаў падраздзяленняў, часцей, злучэнняў, разгорнутая для бою. Кожны від узброеных сіл і род войск мае свае Б. п. Яны ствараюцца з улікам віду, характару і замыслу бою.

Б. п. ўзніклі разам з узброенымі сіламі і мяняліся ў залежнасці ад удасканалення зброі, баявой тэхнікі, спосабаў вядзення бою і якасных змен асабовага саставу. Спачатку, калі арміі карысталіся толькі халоднай зброяй, шчыльныя рады і шарэнгі пяхоты раўнамерна размяшчаліся па фронце і ў глыбіню. З'яўленне агнястрэльнай зброі патрабавала рассыпнога строю і больш самастойнай ролі салдата ў баі. Аднак наёмныя арміі зах.-еўрап. краін да канца 18 ст. захоўвалі лінейны Б. п. з некалькіх шарэнгаў, які даваў магчымасць вялікай колькасці салдатаў весці безупынны агонь і наносіць удар халоднай зброяй без перастраення. Такі Б. п. падтрымліваў дысцыпліну, але скоўваў манеўранасць, і войскі неслі значныя страты. А. В. Сувораў выкарыстоўваў розныя Б. п.: супраць наёмных зах.-еўрап. армій — лінейны, супраць конніцы — карэ (франц. carré — пастраенне пяхоты чатырохвугольнікам), супраць франц. калон — калоны. Для батальёнаў першай лініі ён увёў рассыпны строй. Пашырэнне ў 19 ст. наразной зброі і павелічэнне колькасці артылерыі прывялі да новага драблення Б. п. і пераходу да стралковых ланцугоў, што дало магчымасць салдатам лепш прыстасоўвацца да мясцовасці і паменшыла страты. Стралковы ланцуг забяспечваў спалучэнне агню, удару і манеўру ў час бою. У канцы 19 — пач. 20 ст. Б. п. дзяліўся на байвыя часці і агульны рэзерв. Б. п. часцей, якія непасрэдна вялі бой, меў рассыпны строй; рэзервы часцей, у залежнасці ад мясцовасці і адлегласці да праціўніка, былі ў разамкнутым страі ці ў калонах. На пач. 1-й сусв. вайны Б. п. пяхотнай роты складаўся з трох узводаў у ланцугу з інтэрваламі 1—2 *м* паміж байцамі і ротнай падтрымкі — аднаго ўзвода ў разамкнутым ці самкнутым страі на адлегласці 200 *м* ад ланцуга, У Б. п. батальёна тры роты знаходзіліся наперадзе і адна ззаду (батальённы рэзерв) на адлегласці

200—300 *м* ад лініі ротных рэзерваў. З'яўленне пад канец вайны танкаў змяніла форму Б. п., умацавала іх ударную і агнявую сілу, павялічыла тэмпы і глыбіню наступлення.

У 2-й сусв. вайне ў сувязі з выкарыстаннем вялікай колькасці танкаў, аўтаматычнай зброі і авіяцыі, матарызацыяй пяхоты і механізацыяй артылерыі Б. п. стаў яшчэ больш глыбокі і манеўраны. Б. п. стралковых і бранятанкавых войск меў у асноўным двухэшалонавае пабудаванне. Групоўка артылерыі (зброя, жывая сіла, сродкі цягі, органы баявога забеспячэння, пункты баявога кіравання) размяшчалася як бы ў сярэдзіне Б. п. стралковых і бранятанкавых войск. У канцы вайны Б. п. часцей і злучэнняў звычайна ўключалі першыя і другія, а іншы раз і трэція эшалоны, артыл. групы і рэзервы рознага прызначэння.

Развіццё рэактыўнай і ядзернай зброі выклікала тэндэнцыю да больш раздробленых манеўраных Б. п. Яны павінны забяспечыць эфектыўнае выкарыстанне вынікаў ядзерных і агнявых удараў і выгадных умоў мясцовасці, хуткае ажыццяўленне манеўру сіламі і сродкамі, парашчэнне сілы ўдару ў ходзе бою, найменшыя страты ад ядзернай зброі і інш. сродкаў паражэння праціўніка.

Літ.: Тактика, М., 1966; Петрусь П. М., Шеманский П. В. и Чульский Н. К. Ядерное оружие и развитие тактики, М., 1967.

А. К. Кузуб. Мінск.

БАЯВЫ РАЗЛІК, вызначэнне асобых абавязкаў ваеннаслужачых падраздзялення перад выкананнем баявой задачы або перад правядзеннем тактычнага вучэння. Ва ўзводзе (аддзяленні) у залежнасці ад характару баявой задачы па Б. р. могуць прызначацца навіральнік, сувязны, дазорны, падносчык патронаў і інш.

БАЯВЫХ СЯКЕР КУЛЬТУРА, гл. *Шнуравой керамікі культура.*

БАЯВЫЯ ДРУЖЫНЫ, узброеныя атрады рабочых у час рэвалюцыі 1905—07, зачаткі арганізацыйных формаў баявых сіл пралетарыяту. Узніклі ў гарадах Расіі пасля 9.1.1905 як арганізацыі самаабароны рэвалюц. мас. У час *Снежаньскага ўзброенага паўстання 1905* — гал. сіла паўстанцаў. На Беларусі былі пры с.-д. арг-цыях у Мінску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску і інш. У Мінску атрад рабочых 17.11.1905 заняў друкарню, дзе к-т РСДРП надрукаваў свае лістоўкі. Атрад узброеных рабочых з 100 чал. быў сфарміраваны ў Горках Магілёўскай губ. для дапамогі паўстанцам Масквы. Б. д. Гомеля (300 чал.) папярэдзілі падрыхтаваны ўладамі пагром, раззброілі войсковы атрад на ст. Гомель, затрымлівалі цягнікі з войскамі на Маскву. Вопыт Б. д. бальшавікі выкарысталі ў рэвалюц. баях 1917 і пры фарміраванні Чырв. гвардыі. Б. д. стваралі і эсэры для тэрарыстычных актаў, а таксама меншавікі як атрады самааховы ад чарнасоценцаў.

М. Я. Стральцоў. Мінск.

БАЯВЫЯ ТРАДЫЦЫІ Савецкіх Узброеных Сіл, правілы і звычаі, якія склаліся гістарычна, сталі нормай паводзін воінаў у баі і ў мірны час. Складваліся на аснове рэвалюц. традыцый рабочага класа, Камуніст. партыі, гераічных традыцый народаў Расіі і сав. народа. Увасабляюць лепшыя маральна-баявыя якасці сав. воінаў: бламежную адданасць Радзіме, Камуніст. партыі, Сав. ўраду, справе камунізма, вернасць ваен. прысязе, воінскаму абавязку, мужнасць і адвагу, упэўненасць у сваіх сілах і ў перамозе над ворагам. Патрыят. выхаванне асабовага саставу Сав. Узбр. Сіл на баявых і рэвалюц. традыцыях — найважнейшая састаўная частка палітыка-масавай работы камандзіраў, палітработнікаў, парт. і камсамольскіх арг-цый Сав. Арміі.

Літ.: Багрямян И. Х. Боевые традиции Советских Вооруженных Сил — могучее средство патриотического воспитания трудящихся, М., 1965.

М. М. Валачко. Мінск.

БАЯЛІНАЎ Касымалы (н. 15.9.1902, с. Кок-Майнок, даліна Ісык-Куль), кіргізскі савецкі пісьменнік. Нар. пісьменнік Кірг. ССР (1968). Чл. КПСС з 1925. Сын качэўніка-жывёлавода. Скончыў Алма-Аціпскі пед. ін-т (1925), ін-т журналістыкі (1933). Друкуецца з 1923. Аповесць «Аджар» (1928) пра паўстанне кіргізаў 1916 — першы рэаліст. твор кірг. прозы. Аповесць «На берагах Ісык-Куля» (1946—53) пра патрыятызм і гераізм кірг. калгаснікаў у Айч. вайну. Жыццё кіргізаў у мінулым — тэма аповесці «Даліна Курмана» (1958). Аўтар рамана «Братэрства» (1964).

Тв.: Рус. пер.— Долина Курмана. Повесть, рассказы, очерки, Фрунзе, 1958.

БАЯН, язычковы пнеўматычны клавішны музычны інструмент, удасканалены *гармоніх* з храматычным гукарадам. Прататып Б. зроблены ў Туле М. Белабародавым (1870). Назву «баян» (ад імя легендарнага старарус. спевака) увёў вядомы гарманіст Я. Арланскі-Цітарэнка. У Расіі Б. пашырыўся з 90-х г. 19 ст., у 20 ст. стаў адным з найб. папулярных інструментаў і ў муз. быце беларусаў. Існуюць Б. «гатовыя» (з падрыхтаванымі стандартнымі акордамі ў басе) і «выбарныя» (у басе поўная храматычная гама). На Беларусі выраблянюцца Маладзечанскай ф-кай муз. інструментаў.

Літ.: Мирек А. Из истории аккордеона и баяна, М., 1967.

БАЯНІЦКАЕ, возера ў бас. р. Арэсы, правага прытока Пцічы, у Любанскім р-не Мінскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Катлавіна авальнай формы, выцягнута з З на У. Вада з воз. сцякае ў Арэсу па сістэмах Цахінскага канала. Вадазбор раўнінны. Воз. эўтрофнага тыпу. Водзяцца карась, лешч, шчупак, плотка, гусцяра, акунь.

БАЯНОЎСКІ Леў Іванавіч [10(23).3.1905, Мінск — 2.3.1960], дзяржаўны дзеяч БССР. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1928. З 15 гадоў рабочы на чыгунцы, потым на адм.-гасп., прафсаюзнай і камсамольскай рабоце. Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1938). Заг. аддзела, сакратар Магілёўскага абкома КП(б)Б, першы нам. міністра і міністр мясцовай і паліўнай прамысл. БССР, нам. старшыні Савета нар. гаспадаркі БССР (з 1957). Чл. Рэвізійнай камісіі КП(б)Б (1939). Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

БАЯРДА (Boiardo) Матэо Марыя, граф Скандыяна (1441—19.12.1494), італьянскі паэт, прадстаўнік арыстакратычнага гуманізму эпохі Адраджэння. Займаў высокія прыдворныя пасады ў Ферары, быў губернатарам Модэны і Рэджа. Перакладаў Гарадота, Ксенафонта, Апулея. Наследуючы Вергілію, пісаў эклогі на італьян. і лац. мовах. У зб. «Тры кнігі пра каханне» (1472—76) узоры любоўнай лірыкі 15 ст. Асн. твор — незакончаная паэма «Закаханы Раланд», сюжэт якой запазычаны з франц. гераічнага эпасу, — расказвае пра подзвігі і прыгоды вандроўных рыцараў. Працяг паэмы Б. — «Шэўтаймаваны Раланд» Л. Арыёсты.

Тв.: Tutte le opere, v. 1—2, Milano, 1936—37.

БАЯРСК, вёска ў Ардашынскім с/с Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Краіна Саветаў». За 33 *км* на Пд ад Смаргоні, 303 *км* ад Гродна, 12 *км* ад чыг. ст. Валожын. 295 ж., двароў 82 (1970). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін, швейная майстэрня. Помнік-абеліск землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БАЯРСКАЯ ДУМА, вышэйшы савет феадальнай знаці ў Рускай дзяржаве, заканадарадчы орган пры князю, з 1547 — пры цару; аналагічны дзярж. савету пры каралях у Зах. Еўропе і радзе ў Вялікім княстве Літоўскім.

Найбольш старадаўняя форма Б. д. — нарада князя з дружынай. Склад, правы і абавязкі Б. д. не вызначаліся законам. У яе ўваходзілі баяры, думныя людзі, акольнічыя, дваране, у 16—17 ст.— і дваране, *дзеці баярскія*, дзякі і інш. Часамі выступала як орган княска-баярскай апазіцыі самадзяржаўю. Правы Б. д. абмежаваны ў час *апрычніны* пры Іване IV. Ліквідавана Пятром I у 1711 у сувязі са стварэннем сената.

БАЯРЫ, 1) у рускай дзяржаве 10—17 ст. вярхі феадалаў. Склаліся з родаплемяннной знаці і вярхоў княскай дружыны. Эканам. асновай баярства былі спадчынныя землі, вотчыны. У 12—16 ст. Б. — саслоўе, якое папавала ў дзяржаве. На працягу 17 ст. зліліся з дваранствам; гэтаму садзейнічала ліквідацыя розніцы паміж вотчыннym і паместным землеўладаннем (юрыдычна афармлена ў 1714). 2) Служылыя людзі ў Рус. дзяржаве, якія ўваходзілі ў *Баярскую думу*. 3) У Вялікім княстве Літоўскім ў 13—16 ст. феадалы, а таксама ваенна-служылыя людзі (Б. путныя, панцырныя, конныя). Склад Б. ужо ў 14 ст. быў неаднародны. Адны сваім сацэканам. становішчам набліжаліся да князёў, другія мала чым розніліся ад сялян. У 15—16 ст. ішла далейшая дыферэнцыяцыя Б. на саслоўныя групы. Частка Б. атрымала ад вялікіх князёў прывілеі і дарчыя граматы пра імунітэт, права адчужэння зямель, асабістую недатыкальнасць, вызваленне ад ненайскоўвых абавязкаў і да 16 ст. канчаткова сфарміравалася як феад. саслоўе, аналагічнае польскай *шляхце*. У яго побач з уладальнікамі маёнткаў увайшлі і бедныя шляхціцы, якія самі апрацоўвалі зямлю. Вайсковы пераліс 1528, Літоўскі Статут 1529, *«Устава на валокі»* 1557, законы пра парадак доказу належнасці да шляхты паступова ператварылі яе ў замкнёнае саслоўе. За яго межамі асталася значная частка былых ваенных слуг, якія захавалі назву Б. Іх прававое становішча рэзка пагоршала і наблізілася да становішча сялян. 4) У 2-й пал. 17 і 18 ст. на Беларусі і ў Літве — адна з катэгорый сялянства, якая адрозвалася характарам феад. павіннасцей. У яе ўваходзілі пашчадкі былых ваенна-служылых людзей і выхадцы з асн. масы сялян. Гэтыя Б. ўжо не карысталіся асабістай свабодай, не служылі ў апалчэнні і з'яўляліся прыгоннымі. За свой надзел выконвалі на карысць феадала павіннасць пасыльных, вазілі грузы, плацілі грашовы аброк (чынш). Часта на іх ускладаліся паліцэйскія абавязкі ў маёнтках. Спачатку вылучаліся сярод сялян заможнасцю, але паступова гэтая розніца сціралася. Да канца 18 ст. феадалы перавялі многіх Б. на становішча аброчных і цяглых сялян. 5) У Румыніі — феадалы і памешчыкі. Як клас ліквідаваны паводле закону аб аграрнай рэформе 20.3.1945.

Літ.: Похилевич Д. Л. Крестьяне-слуги в Великом княжестве Литовском в XVII—XVIII веках, у зб.: Средние века, в. 21, М., 1962; Грицкевич А. П. Хозяйственное и правовое положение военно-служилого населения в Слуцком княжестве в XVI—XVIII вв., у кн.: Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г., Мн., 1964; Kutrzeba S. Historia ustroju Polski w zarysie, t 2, 2 wyd., Lwów — Warszawa, 1921.

П. Г. Казлоўскі. Мінск.

БАЯРЫ, вёска ў Лошніцкім с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 25 *км* на ПнУ ад Барысава, 96 *км* ад Мінска, 1,5 *км* ад чыг. ст. Прыяміна, каля шашы Мінск — Масква (3 *км*). 387 ж., двароў 120 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БАЯРЫ, вёска ў Астрошыцкім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл., на левым беразе р. Усяжа. Цэнтр саўгаса «Савецкая Беларусь». За 17 *км* на ПдЗ ад Лагойска, 33 *км* ад Мінска. 69 ж., двароў 21 (1970).

БАЯРЫ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., каля воз. Мядзел (2 *км*). Падпарадкоўваецца Мядзельскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». За 5 *км* на Пн ад Мядзела, 150 *км* ад Мінска, 30 *км* ад чыг. ст. Паставы. 240 ж., двароў 70 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам Айч. вайны.



БЕБЕЛЬ (Bebel) Аўгуст (22.2.1840, Кёльн — 13.8.1913), дзеяч германскага і міжнароднага рабочага руху, адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў германскай сацыял-дэмакратыі і 2-га Інтэрнацыянала. З беднай сям'і унтэр-афіцэра. Па прафесіі токар. У пач. 60-х г. уключыўся ў рабочы рух, пад уплывам

В. *Лібкнехта* стаў марксістам. У 1867 выбраны прэзідэнтам Аб'яднання ням. рабочых саюзаў. Адстойваў рэвалюц.-дэмакр. шлях аб'яднання Германіі, вёў барацьбу супраць ласальянцаў, якія падтрымлівалі бісмаркаўскую палітыку аб'яднання краіны «зверху». У 1869 на з'ездзе ў Эйзенаху пад кіраўніцтвам Бебеля і Лібкнехта створана с.-д. рабочая партыя Германіі (эйзенахцы), якая трымалася прынцыпаў 1-га Інтэрнацыянала. У час франка-прускай вайны 1870—71 займаў інтэрнацыяналісцкую пазіцыю; абараняў Парыжскую камуну, за гэта прыгавораны да зняволення ў крэпасці. У 1875 на Гоцкім аб'яднальным з'ездзе ласальянскага Усеагульнага герм. рабочага саюза і с.-д. рабочай партыі Германіі з удзелам Б. адбылося аб'яднанне эйзенахцаў і ласальянцаў у адзіную партыю. З-за тактычных меркаванняў Б. не выступіў адкрыта супраць праекта с.-д. праграмы, які быў прыняты на гэтым з'ездзе. Гоцкая праграма мела апартуністычны характар, яе рэзка крытыкавалі К. Маркс і Ф. Энгельс. У перыяд дзеяння *Выключнага закону супраць сацыялістаў* (1878—90) с.-д. партыя Германіі пад кіраўніцтвам Бебеля і Лібкнехта навучылася спалучаць легальную і нелегальную работу. Б. змагаўся з рэвізіянізмам у міжнар. рабочым руху, хоць сам дапускаў цэнтрысцкія, апартуніст. памылкі па шэрагу пытанняў (аграрнае, пытанне пра вайну, ацэнка дзяржавы і інш.). З'яўляючыся вучнем і паслядоўнікам Маркса і Энгельса, Б. прапагандаваў і абгрунтоўваў матэрыяліст. разуменне гісторыі, навук. атэізм, выкрываў т. зв. хрысціянскі сацыялізм. Быў палымяным змагаром супраць мілітарызму і вайны, аддаваў шмат увагі праблемам асветы, маралі, жапочаму пытанню.

Тв.: Женщина и социализм, М., 1959; Христианство и социализм, М., 1959; Из моей жизни, М., 1963.

Літ.: Ленін У. І. Два светы, Тв., т. 16 (Полн. собр. соч., т. 20); яго ж. Аўгуст Бебель, Тв., т. 19 (там жа, т. 23); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25, раздз. 4 (там жа, т. 33, раздз. 4).

БЕБУТАЎ Валерый Міхайлавіч [6(18).12.1885, Царыцын — 1.11.1961], рускі савецкі рэжысёр. Засл. арт. РСФСР (1934), засл. дз. маст. Тат. АССР (1945). Творчую дзейнасць пачаў у 1912 (МХТ). У 1920 удзельнічаў (з У. Меерхольдам) у стварэнні т-ра РСФСР 1-га. З 1924 узначальваў Т-р муз. буфанады (Т-р муз. камедыі). Пастаноўкі ў розных т-рах: «Смерць Тарэлкіна» А. Сухаво-Кабыліна, «Карневільскія званы» Р. Планкета, «Маскарад» М. Лермантава, «Кароль Лір» У. Шэкспіра; у 1946, 1955 «Гамлет» у т-ры імя Я. Коласа (адзін з найлепшых шэкспіраўскіх спектакляў на Беларусі).

БЕГ, адзін са сродкаў хуткага перамяшчэння і адзін з відаў натуральных фізічных практыкаванняў. Самастойны від спорту ў лёгкай атлетыцы і састаўная частка інш. відаў (футбол, баскетбол і інш.).

Спартыўны Б. бывае без перашкод (гладкі) і з перашкодамі. Дыстанцыі гладкага Б. падзяляюцца на кароткія, сярэднія, доўгія і звышдоўгія. Б. на дыстанцыях да звышдоўгіх праводзіцца звычайна на стадыёне на бегавой дарожцы; на звышдоўгія дыстанцыі (напр., марафонская — 42 км 195 м) — на шашы з асфальтавым ці інш. цвёрдым пакрыццём. Да гладкага Б. адносіцца эстафетны (камандны), дзе кожны спартсмен прабягае па чарзе роўныя адрэзкі дыстанцыі і перадае эстафетную палачку напарніку, які бяжыць наст. этап. Да Б. з перашкодамі адносіцца бар'ерны, на 3000 м з перашкодамі і кросавы. Пры бар'ерным на ўсіх дыстанцыях устанаўліваецца па 10 бар'ераў. Б. на 3000 м з перашкодамі праводзіцца на стадыёне, дзе ставяцца 5 бар'ераў праз пэўныя адлегласці і апошні — перад ямай з вадой. Кросавы Б. праводзіцца на перасечанай мясцовасці з пераадоленнем прыродных перашкод: канаў, хмызнякоў, пад'ёмаў, спускаў і г. д. *В. Б. Левінсон.* Мінск.

БЕГЕМОТ, гіпапатам (Hippopotamidae), род млекакормячых жывёл атрада парнакапытных. Уключае 2 сучасныя віды: Б. звычайны, або вялікі (H. amphibius), і Б. ліберыйскі, або малы (H. liberiensis). У Б. звычайнага (даўж. да 4,5 *м*, маса каля 2,5 *т*) даўгаватае грузнае тулава, амаль голая скура медна-бурага колеру. Ногі тоўстыя, кароткія. Пашыраны ў Цэнтр. Афрыцы. Корміцца воднай і прыбярэжнай расліннасцю. Нараджае 1 дзіцяня, цяжарнасць 7—8 месяцаў. Жыве да 50 гадоў. Б. ліберыйскі меншых памераў (даўж. да 185 *см*), пашыраны ў Ліберыі і Паўд. Судане. Спосаб жыцця вывучаны слаба. Мяса, тлушч, скура і зубы Б. выкарыстоўваюцца мясц. жыхарамі.



Бегемот звычайны.

БЕГМА Васіль Андрэевіч [19.12.1905 (1.1.1906), Адэса — 12.8.1965], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на Украіне ў Айч. вайну. Ген.-м. (1943). З рабочых. Чл. КПСС з 1927. Працаваў рабочым, у 1928—41 на камсамольскай, прафс. і парт. рабоце. З 1941 чл. Ваенсавета 12-й арміі; з 1942 сакратар Ровенскага падпольнага абкома КП(б)У, камандзір партыз. злучэння. Праводзіў сумесныя баявыя аперацыі з Палескім і Пінскім партыз. злучэннямі (баі ў Стадолічах, Сінкевічах, пад Столінам, Храпуном і інш.). У 1944—49 першы сакратар Ровенскага, у 1950—59 Хмяльніцкага абкомаў КПУ. З мая 1959 старшыня Парт. камісіі пры ЦК КПУ. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—5-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі.

БЕГУНЫ, тэхналагічнае абсталяванне для нарыхтоўкі дробнамолатай сумесі з сыпкіх ці кускавых матэрыялаў. Карыстаюцца Б. ў ліцейнай і будаўнічай вытв., горнарудпай прамысл., у гутах. На Беларусі выпускаюцца аўтаматычныя Б. (Ваўкавыскі з-д ліцейнага абсталявання).



Бегуны Ваўкавыскага завода ліцейнага абсталявання.

Асн. частка Б. — 2 масіўныя каткі («бегуны»), якія перакочваюцца па днішчы або па сценцы чаши. Засыпаюць кампаненты замесу в бункераў праз дазатары, адначасова падаецца вада. Каткі перакочваюцца са слізганнем, ад чаго дробна мелюцца і раўнамерна перамешваюцца матэрыялы. Гатовая сумесь праз люкі ў днішчы ссыпаецца на стужкавы транспарцёр.

БЕДЛЕНД (англ. bad lands літар. дрэнныя землі), непрыгодныя для земляробства землі. Рэльеф іх рэзка расчлянёны з мностваи забытаных яроў (са шматлікімі агалінаваннямі) і вузкіх водападзелаў. Узнікае на ўчастках, складзеных з водатрывалых гліністых парод, пры размыве іх ліўневымі патокамі ў пустынных і паўпустынных, часам стэпавых і паўстэпавых раёнах свету. Класічны Б. пашыраны ў ЗША (Небраска, Дакота); ёсць у СССР (пустынныя перадгор'і Сярэд. Азіі, месцамі ў Казахстане).

БЕДНЫ Дзям'ян [сапр. Прыдвораў Яфім Аляксеевіч; 1(13).4.1883, в. Губаўка Аляксандраўскага пав. Херсонскай губ.— 25.5.1945], рускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1912. З бедных сялян. Вучыўся ў Кіеўскай ваенна-фельч. школе (1896—1900). Пасля службы ў арміі (1900—04) скончыў экстэрнам класічную гімназію і паступіў на гістор.-філал. ф-т Пецярбургскага ун-та (1904—08). Літ. дзейнасць пачаў у 1899. Супрацоўнічаў у бальшавіцкіх газ. «Звезда» (з 1911), «Правда» (з 1-га нумара), час. «Просвещение». Адзін з першых звязаў сваю творчасць з прапагандысцкай работай бальшавіцкай партыі. Наследуючы І. Крылову, М. Някрасаву, В. Курачкіну, развіваў жанры байкі, вершаванага фельетона, эпіграмы. Першы зб. Б. «Байкі» (1913) прыхільна сустрэў У. І. Ленін. У 1917 газ. «Правда» апубл. аповесць у вершах «Пра зямлю, пра волю, пра рабочую долю» — гераіка-сатыр. эпапею рэвалюцыі. У грамадз. вайну папулярнасць сярод рабочых і сялян набылі чырвонаармейскія песні («Праводзіны»), сатыры на ворагаў рэвалюцыі («Маніфест барона фон Урангеля»), жартоўныя («Танька-Ванька») і антырэліг. («Запаветная зямля») вершы. У 1920 некат. творы ўпершыню надрукаваў у бел. газ. «Звязда» («Нашым братам — польскім сялянам», «Кузьма Хлапушкін», «Вялікая штука — навука», «Пан Кміта»). Паэма «Галоўная вуліца» (1922) напісана да 5-годдзя Кастр. рэв. У 20-я г. адстойваў пазіцыі народнасці і партыйнасці л-ры («Біў бы лбом», «Пра салаўя»). У фельетонах і памфлетах выкрываў ворагаў Сав. улады. Вершы «Любімаму», «Сняжынкі» прысвяціў У. І. Леніну. У Айч. вайну выступаў з патрыят. вершамі, антыфаш. сатырай, супрацоўнічаў у «Окнах ТАСС». Творы Б. блізкія да фальклорных жанраў — песні, прыпеўкі, раешніка; многія радкі яго вершаў сталі прыказкамі. Паэзіі Б. ўласцівы грамадз. пафас, баявая публіцыстычнасць. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.



Тв.: Собр. соч., т. 1—8, М., 1963—65; бел. пер.— Пра папоў, Мн., 1931; у кн.: Руская савецкая паэзія, Мн., 1953.

Літ.: Макаров А. Н. Демьян Бедный, М., 1964; Эвентов И. С. Жизнь и творчество Демьяна Бедного, Л., 1967; Бразуль И. Д. Демьян Бедный, М., 1967 (Жизнь замечательных людей).

«БЕДНЯК», штодзённая сялянская газета, якая выдавалася з 25.9.1918 да жн. 1919 на рус. мове і выходзіла спачатку ў Смаленску як выданне Паўн.-Зах абл. камітэта РКП(б), з 25.2.1919 у Мінску як орган ЦБ КП(б)Б, з 12.3.1919 орган Цэнтральнага і Мінскага губ. камітэтаў КП(б) Літвы і Беларусі. Шырока асвятляла жыццё Сав. краіны, друкавала пісьмы сялян, матэрыялы пра дзейнасць камітэтаў беднаты, сельскіх камуністаў, пра барацьбу сав. народа з інтэрвентамі. Больш за 900 тыс. экз. «Б.» заслана ў акупаваныя р-ны Беларусі. Пастаянныя аддзелы і рубрыкі: «Па Расіі», «За рубяжом», «У ворагаў Савецкай улады», «Чырвоная Армія» («Чырвоны фронт»), «Партыйнае жыццё», «Вясковае жыццё» і інш. Сярод аўтараў быў А. Ф. Мяснікоў. *Г. Л. Напрэеў.* Мінск.

БЕДУІНЫ (араб. бедэўін — жыхары стэпу), вандроўныя і паўвандроўныя арабыжывёлаводы Аравійскага п-ва і Паўн. Афрыкі. У вузкім сэнсе слова качэўнікі-вярблюдаводы. З пачатку 20 ст. пераходзяць на аселасць.

Літ.: Народы Передней Азии, М., 1957 (Народы мира).

БЕЖАНЦЫ, мірнае насельніцтва, якое ў выніку ваенных дзеянняў вымушана пакідаць родныя мясціны. Бежанства, уласцівае ўсякай вайне, асабліва вялікія памеры набыло ў 1-ю і 2-ю сусв. войны. У 1-ю сусв. вайну (1914—18) з набліжэннем фронту прымусова высялялася насельніцтва цэлых паветаў і губерняў. Паводле няпоўных звестак у Расіі на 1.2.1917 было больш за 3 млн. Б., у т. л. 1320 тыс. чал. з Беларусі і Літвы. Толькі з Гродзенскай губ. выехала 750 680 чал. Пасля заключэння *Рыжскага мірнага дагавору 1921* больш за 500 тыс. Б. вярнулася ў Зах. Беларусь. У 2-ю сусв. вайну з родных мясцін гітлераўцы выгналі дзесяткі мільёнаў людзей. У выніку прымусовага вывазу фашыстамі насельніцтва з захопленых тэрыторый у Германію на катаржныя работы ўзнікла катэгорыя *перамешчаных асоб*. Сав. ўрад заўсёды стаяў за вяртанне людзей на радзіму. У выніку рашучай і паслядоўнай палітыкі Сав. Саюза, нягледзячы на перашкоды імперыялістаў, удалося вярнуць на радзіму тысячы сав. грамадзян. *Л. М. Лыч.* Мінск.

БЕЗАДВАЛЬНАЯ АПРАЦОЎКА глебы, сістэма глыбокай апрацоўкі глебы безадвальнымі плугамі, распрацаваная наватарам калгаснай вытворчасці Ц. С. Мальцавым у 40—50-я г. 20 ст. Ужываецца ў Казахстане, Зах. Сібіры і ў чарназёмнай зоне на змытых

глебах па схілах. Ва ўмовах Паўд. Заўралля і Сібіры глыбокае ворыва (40—50 *см*) чаргуюць з лушчэннем дыскавымі прыладамі на глыбіню 8—10 *см*. Папары апрацоўваюць безадвальнымі плугамі на глыбіню 35—40 *см* праз 4—5 гадоў і 3—4 гады сеюць збожжавыя і інш. аднагадовыя культуры пасля лушчэння ржышча. Б. а. знішчае пустазелле, павялічвае акультураны ворны слой без перамешвання яго, найменш разбурае структуру, назапашвае вільгаць.

Літ.: Мальцев Т. С. Новая система обработки почвы и посева, М., 1955; Доганов-ский М. Г. и Сапожников Н. А. Обработка почвы по методу Т. С. Мальцева, Л., 1955.

БЕЗАКІСЛЯЛЬНЫ НАГРЭЎ, высокатэмпературны нагрэў металічных загатовак ці вырабаў без акіслення іх паверхні. Ужываецца ў кавальска-штамповачнай вытв. і пры тэрмаапрацоўцы.

Б. н. робіцца ў электрычных або полымных печах з ахоўнай ці нейтральнай газавай атмасферай, у расплаве солі (радзей свінцу), слаі парашку. Б. н. вугляродзістай сталі робіцца ў атмасферы, якая ўтвараецца пры спальванні прыроднага газу ці бутану. Вязвокіснай атмасферай для медзі можа быць вадзяная пара. Светлы (без акіслення паверхні вырабаў) нагрэў алюмініевай, хромістай і берыліевай бронзы робіцца ў атмасферы дысацыяванага амяку. Каб пазбегнуць акіслення, вырабы з тытану, цырконію або іх сплаваў награюць у атмасферы аргону. У саляных ваннах награюць стальны інструмент пры тэрмаапрацоўцы. У Ін-це цепла- і масаабмену АН БССР распрацаваны паскораны Б. н. метал. загатовак у кіпячым слаі прамежкавага цепланосьбіта. Страты металу на акаліну ў некалькі разоў меншыя, чым пры звычайным нагрэве. *Л. С. Ляховіч.* Мінск.

БЕЗБАРОДАЎ Міхаіл Аляксеевіч [н. 2(14). 10.1898, С.-Пецярбург], савецкі хімік-тэхнолаг. Акад. АН БССР (1950, чл.-кар. з 1947). З 1922 працуе ў сілікатнай прамысловасці. У 1935—41 і 1945—60 заг. кафедры сілікатаў і шкла Беларускага політэхн. ін-та, арганізатар і заг. лабараторыі фіз. хіміі сілікатаў Ін-та хіміі АН БССР (1957—60). Працы ў галіне фіз. хіміі шкла і сілікатаў: сінтэз неарган. шкла, узнікненне дэфектаў у шкле і метады іх папярэджання, хім. ўстойлівасць шкла. На падставе даследавання хім. саставу старажытнага і сярэдневяковага шкла распрацаваў метад яго датавання і лакальнай прыналежнасці. Дзярж. прэмія СССР 1951. Узнаг. 2 ордэнамі, а таксама медалямі.



Тв.: Синтез и строение силикатных стекол, Мн., 1968.

Літ.: Міхаіл Аляксеевіч Безбародаў. «Весці АН БССР. Сер. фіз.-тэхн. навук», 1958, № 4 (бібліягр.).

БЕЗГАСПАДАРСКАЯ МАЕМАСЦЬ, маёмасць, у якой няма ўласніка або ён невядомы. Б. м. лічыцца такая, ад якой уласнік адмовіўся або не запатрабаваў у пэўны час *(знаходка)*, знойдзены скарб, грузы чыг. і воднага транспарту і паштовыя адпраўленні, незапатрабаваныя па сканчэнні спец. часу хавання, і інш. Як правіла, Б. м пераходзіць ва ўласнасць дзяржавы ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

БЕЗДЗЕЖ, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Новы шлях». За 20 *км* на ПнУ ад Драгічына, 137 *км* ад Брэста, 27 *км* ад чыг. ст. Драгічын. 1780 ж., дварoў 479 (1970). Атэльe раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі, 2 магазіны.

БЕЗДЗЕНСКАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ 1861, выступленне сялян Казанскай губ. ў адказ на сялянскую рэформу 19.2.1861.

Пачалося ў в. Бездна (в. Антонаўка) Спаскага пав. пад кіраўніцтвам селяніна А. Пятрова (А. П. Сідарава), які абвясціў сялянам, што ўся зямля належыць ім і што яны не павінны больш працаваць на паноў. Хваляванні ахапілі больш як 75 вёсак. Каля 10 тыс. сялян адмовіліся адбываць паншчыну, выконваць распараджэнні адміністрацыі, забіралі панскае збожжа. 12 крас. ў Бездну прыбыў карны атрад і пачаў страляць у натоўп сялян. Было забіта і паранена больш за 350 чал., многія арыштаваны, пакараны розгамі. Паводле прыгавору ваенна-палявога суда Пятрова расстралялі. Расправа над удзельнікамі Б. в. выклікала пратэст дэмакратычных колаў у Расіі і за мяжою.

БЕЗ-КАРНІЛОВІЧ Міхаіл Восіпавіч [29.9 (10.10).1796—7(19.1).1862], беларускі дваранскі гісторык, краязнавец і этнограф, вайсковы тапограф і статыстык, генерал-маёр рускай арміі. З дваран. Брат дзекабрыста А. В. Карніловіча. Скончыў 1-ы кадэцкі корпус (1816). З 1822 у корпусе вайсковых тапографаў. Удзельнік рус.-турэцкай вайны 1828—29. У 1831—47 нач. здымкаў і вайскова-стат. вывучэння Мінскай, Наўгародскай, Валынскай губ. і Беластоцкай акругі. Аўтар прац па бел. гістар. краязнаўстве. Тэр. Беларусі абмяжоўваў Віцебскай і Магілёўскай губ., беларусамі лічыў толькі «нашчадкаў крывічоў». Адзначаў згуртаванасць Полацкай зямлі ў 30—40-я г. 13 ст. ў барацьбе з ням. агрэсіяй, дказваў паходжанне вял. князя Вял. кн. Літоўскага Віценя з роду полацкіх князёў. Быт бел. сялянства адлюстроўваў аб'ектыўна, але выступаў за захаванне яго патрыярхальнага ўкладу і прыгонніцтва.

Тв.: Витебская губерния, СПб., 1852; Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся, СПб., 1855.

Літ.: Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964.

БЕЗНАСЕНКА, старадаўні рускі летні сорт грушы. Многія плады не маюць насення (адсюль назва). Плады светла-жоўтыя з карычнева-чырвоным румянцам. Важаць каля 80 *г*. Мякаць жоўтая, сакаўная, салодкая. Б. пачынае пладаносіць на 5—7-м годзе і амаль штогод дае добры ўраджай; 15—20-гадовае дрэва — да 140—240 *кг* пладоў. Лепшыя апыляльнікі: *Ільінка, Аляксандраўка, Сапяжанка.* Раяніраваны як асн. летні сорт ва ўсіх зонах БССР.

Літ.: Гл. пры арт. *Груша.*

БЕЗНАЯЎНЫЯ РАЗЛІКІ, разлікі, якія выконваюцца без удзелу наяўных грошай шляхам пераводу (пераліку) грашовых сродкаў з рахунку плацельшчыка на рахунак крэдытора. У СССР Б. р.— асн. спосаб разлікаў паміж сацыялісг. прадпрыемствамі, гасп. арг-цыямі і ўстановамі. Безнаяўны плацежны абарот у БССР склаў у 1969 больш за 35 млрд. руб.

Ажыццяўляюцца Б. р. ў розных формах праз Дзяржбанк, яго філіялы і ашчадкасы на аснове разліковых дакументаў (плацежных патрабаванняў ці даручэнняў, чэкаў, акрэдытыўных заяў і інш.). Гал. формы разлікаў — акцэптная, акрэдытыўная, разлікі праз асобны рахунак, планавыя плацяжы, разлікі па транзітных адгрузках і г. д. Найбольш пашырана акцэптная форма разлікаў, калі плацеж праводзіцца толькі са згоды плацельшчыка паводле дакументаў, напісаных пастаўшчыком. У БССР у 1969 гэтая форма склала 62% ад усіх разлікаў за матэрыяльныя каштоўнасці. Пры акрэдытыўнай форме разлікаў аплата плацежных дакументаў робіцца па месцы знаходжання пастаўшчыка са сродкаў, спецыяльна забраніраваных пакупніком у банку. Кожны акрэдытыў прызначаецца для разлікаў толькі з адным пастаўшчыком і не можа быць пераадрасаваны. Разлікі па акрэдытыве праводзяцца пераважна па разавых здзелках. Сістэма Б. р. эканоміць грамадскія выдаткі, зніжае расходы па грашовае абарачэнне, змяншае патрэбу ў наяўных грашах, садзейнічае канцэнтрацыі і лепшаму выкарыстанню свабодных грошай. Ва ўмовах капіталізму Б. р. спрыяюць канцэнтрацыі вялікіх грашовых сум у руках банкаў і праводзяцца пераважна праз разліковыя палаты. Аб'ектыўная аснова развіцця Б. р.— павелічэнне таварнага абарачэння і патрэбаў для яго абслугоўвання наяўных грошай. У перыяд уздыму капіталіст. вытворчасці павялічваецца купля-продаж, набывае размах крэдыт і ў выніку аб'ём Б. р. значна расце. У перыяд крызісаў, наадварот, вытворчасць і камерцыйны крэдыт рэзка скарачаюцца, узнікае пагоня за наяўнымі грашыма, што падрывае сістэму Б. р.

У. Ф. Блізнец. Мінск.

БЕЗРУЧ (Bezruč) Пётр (сапр. Вашак Уладзімір; 15.9.1867, Опава — 17.2.1958), чэшскі паэт. Нар. паэт рэспублікі (1945). З сям'і вучонага-філолага. Вучыўся ў Карлавым ун-це ў Празе. Першыя вершы надрукаваў у 1899. У зб. «Сілезскія песні» (1909, наступныя выд. папаўняліся новымі вершамі) упершыню ў чэшскай паэзіі выступіў ад імя пралетарыяту супраць нац. і сац. прыгнёту. У сатыр. творы «Рэспубліка перад св. Пятром» (1923) і лірычнай паэме «Блакітны матылёк» (1931) выкрываў парадкі бурж. Чэхаславакіі. У час фаш. акупацыі быў пад наглядам гестапа.

Тв.: Рус. пер.— Силезские песни, М., 1958.

БЕЗУМОЎНЫ РЭФЛЁКС, гл. *Рэфлексы.*

БЕЗЫМЕНСКІ Аляксандр Ільіч [н. 7(19).1. 1898, Жытомір], рускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1916. Удзельнік Кастр. рэв. ў Петраградзе. Быў па камсамольскай і парт. рабоце. Друкуецца з 1918. Першыя кн. «Кастрычніцкія зоры» (1920), «Да сонца» (1921) адзначаны рысамі «касмічнай» рыторыкі. Паэма «Камсамолія» (1924), зб. «Як пахне жыццё» (1924) паэтызуюць гераічныя справы сав. моладзі, акрыленай Кастрычнікам. Аўтар камсамольскай песні «Маладая Гвардыя», верша «Партбілет» № 224332», паэм «Уладзімір Ільіч Ульянаў», «Фелікс» (пра Ф. Э. Дзяржынскага), «Трагедыйная ноч» (пра буд-ва Днепрагэса). У зб. сатыр. вершаў «Гнеўныя радкі» (1949) асуджае падпальшчыкаў вайны. Публіцыст, сатырык. Узнаг. 5 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Избр. произв. 1918—1958, т. 1—2, М., 1958; бел. пер.— Страл, Мн., 1931; у кн.: Анталогія рускай савецкай паэзіі, Мн., 1936; Руская савецкая паэзія, Мн., 1953.

БЕЙРУТ, сталіца Лівана з часу абвяшчэння незалежнасці краіны (1943). На ўзгорыстым п-ве ўсх. ўзбярэжжа Міжземнага м. Утварае асобную правінцыю. Гал. порт краіны. Вузел чыгунак і шашэйных дарог. Міжнар. аэрапорт. 750 тыс. ж. (1968).

Б. (стараж. назва Берыт) вядомы з 15 ст. да н. э. як горад і порт Фінікіі. У эліністычна-рымскі перыяд вялікі гандл.-рамесніцкі цэнтр, меў права чаканіць манету. У 635 захоплены арабамі, у 1110 крыжаносцамі. У 1516—1918 (з перапынкамі) тур. ўладанне. Пры эміру Фахр-ад-дзіне II [1590—1635], які стварыў незалежную ліванскую дзяржаву, быў яе сталіцай. У кастр. 1918 акупаваны войскамі Антанты. З 1920 сталіца падмандатнага Францыі Лівана. У ліст. 1943 і маі 1945 тут адбыліся вял. антыфранц. дэманстрацыі і ўзбр. сутычкі з акупантамі. У 1946 замежныя войскі выведзены з Б.

У Б. сканцэнтравана больш за палову ўсёй прамысловасці краіны, 80—90% абароту ўнутранага і 100% знешняга гандлю, амаль уся фін. дзейнасць (больш за 40 банкаў). Прадпрыемствы тэкст., трыкатажнай, гарбарнай, тытунёвай, металаапр. і харч. прамысловасці. Сярод арх. помнікаў сярэдневякоўя: мячэць Амара (Джамі аль-Амары, перабудаваная ў 1291 з ц. Іаана Хрысціцеля), «Палацавая» мячэць (пач. 16 ст.). Пасля 1950 горад расце на Пд. Добраўпарадкоўваецца сетка асфальтаваных вуліц: паяўляюцца шматпавярховыя грамадскія будынкі і жылыя дамы сучаснай архітэктуры (спалучэнне бетону, мясцовага каменю і шкла). У паўн. частцы горада пабудаваны атэль «Сен-Жорж» (1932—49), будынак Міністэрства юстыцыі (1968, абодва арх. А. Табета), будынак прэсы (50-я г., арх. Б. Х. Макдысі і інш.), стадыён на 100 тыс. гледачоў (1956), атэль «Фінікія» (1962, арх. Э. Стоўн і Р. Эляс) і інш. За 25 *км* ад Б. палац Бейт эд-дзін, аздоблены мармурам і роспісам (19—20 ст.). Б.— культурны цэнтр краіны: 3 ун-ты, Нац. б-ка, археал. музей.

БЕЙСБОЛ (англ. base база + ball мяч), спартыўная гульня з мячом, нагадвае лапту. Узнік у ЗША ў пач. 19 ст. Гульня вядзецца на роўнай травяной пляцоўцы, якая мае форму ромба, а па вуглах — «базы». Для гульні патрэбны спец. біта, мяч і пальчаткі. Гуляюць 2 каманды па 9 чалавек. Мэта гульні: за час, пакуль адзін з ігракоў ударам біты паслаў мяч у поле, напарнікі яго павінны зрабіць як мага больш перабежак ад «базы» да «базы» і не быць зачэпленымі мячом. Пашыраны ў ЗША, Англіі, Канадзе, Аўстраліі і інш. краінах.

БЕЙШЭНАЛІЕВА Бюбюсара (н. 15.9.1926, с. Таш-Добе каля Фрунзе), кіргізская савецкая балерына. Нар. арт. СССР (1958). З 1941 салістка Кірг. т-ра оперы і балета. Стварыла яркія вобразы ў нац. рэпертуары (Чалпон і

Айдай, Анар, Зейнеп у балетах «Чалпон» М. Раўхвергера, «Анар» У. Уласава і У. Ферэ, «Куйручук» К. Малдабасанава і Г. Окунева); выконвае гал. партыі ў класічных і сав. балетах. Спалучае тэхн. дасканаласць з тонкім адчуваннем музыкі, майстэрствам лагічнага развіцця вобраза. Дэп. Вярх. Савета СССР 6—7-га скл. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

БЕКАР (франц. bécarre), знак *альтэрацыі*.

БЕКАРЫ ЯМА (*біятэрмічная яма, чэшская яма*), збудаванне, у якім знішчаюць і абеззаражваюць трупы жывёл. Будуецца з вільгаце- і тэрмаўстойлівага матэрыялу, мае герметычную накрыўку і адтуліны для прытоку паветра. Плошча ямы (*м*) 3×3, глыбіня 9—10 *м*. Размяшчаецца не бліжэй як за 1 *км* ад жылых будынкаў, прамысловых прадпрыемстваў і вадаёмаў. Трупы гніюць з дапамогай тэрмафільных мікраарганізмаў. Т-ра ў камеры падымаецца да 65—70° С, і заразны матэрыял стэрылізуецца.

БЕКАРЭВІЧ Сцяпан Міхайлавіч (г. н. і см. невяд.), беларускі краязнавец і этнограф 60-х г. 19 ст. Быў свяшчэннікам Нежкаўскай царквы Магілёўскага пав., вывучаў сямейны побыт, абрады і вераванні сялян Магілёўшчыны. У газ. «Могилевские губернские ведомости» надрукаваў арт. «Сельскія нарысы. Сяло Нежкава» (1864, № 31, 33, 45), «Вясельны абрад у сялян у прыходзе с. Нежкава Магілёўскага павета» (1865, № 13), «Погляд на ўласнасць» (1867, № 29) і інш.

Літ.: Вандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964.

БЕКЕР Ян Самуэль (г. н. і см. невяд.), архітэктар. Працаваў у князёў Сапегаў. Работы: палац у стылі ранняга класіцызму ў *Дзярэчыне* (1786, з арх. Л. Гуцэвічам; разбураны ў Вял. Айч. вайну); перабудова *Ружанскага палаца* (1788), прыходскі касцёл, манастыр, касцёл базыльянаў (усе ў Ружанах).

БЕКЕРЭЛЬ (Becquerel) Антуан Анры (15.12.1852, Парыж — 25.8.1908), французскі фізік. Чл. Парыжскай АН (1889), праф. Парыжскай політэхн. школы. Працаваў у галіне фіз. оптыкі, электрычнасці, фотахіміі і метэаралогіі. У 1896 пры даследаванні фасфарасцэнцыі адкрыў *радыеактыўнасць*, за што з М. Складоўскай-Кюры і П. Кюры атрымаў Нобелеўскую прэмію 1903.

Літ.: Капустинская К. А. Анри Беккерель, М., 1965.

БЕКЕШ (Bekeš) Каспар (1520—79), беларускі мысліцель-антытрынітарый. Венгр па паходжанні. Удзельнік войнаў польскага караля Стэфана Баторыя. Вакол Б. ў Беларусі на Гродзеншчыне і ў Літве групаваліся прыхільнікі антытрынітарства (гл. *Антытрынітарыі*), якія сваім светапоглядам былі блізкія да атэізму. Як сцвярджалі сучаснікі, Б. не прытрымліваўся ніякай рэлігіі, а пад канец жыцця стаў атэістам. Пасля смерці Б. піводная царква не згаджалася яго прызнаваць, і кароль загадаў перавезці яго цела з Гродна ў Вільню і там пахаваць. Паводле паказу Б. на яго магіле напісалі: «...Не веру ў бога, не прагну яго неба, не баюся пекла, не турбуюся пра божы суд, не трывожуся пра цела і тым больш пра душу, якая памерла разам са мною...»

Тв.: У кн.: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии, Мн., 1962.

Літ.: Алексютовіч М. [Каспар Бекеш], «Полымя», 1967, № 2; Merczyng H. Polscy deiści i wolnomyśliciele za Jagiellonów, Warszawa, 1911.

С. А. Падокшын.

БЕКІШАЎ Іван Андрэевіч [падп. імя Андрэй; н. 20.5(2.6).1913, в. Ноўка Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.], кіраўнік падпольнай разведвальна-дыверсійнай групы ў Віцебску ў Айч. вайну. Чл. КПСС з 1944. З 1930 працаваў у Суражскім райкоме ЛКСМБ, сакратаром Станькаўскага сельсавета Віцебскай вобл. У 1941 удзельнічаў у баях з ням.-фаш. захопнікамі. Прарваўшыся з акружэння, пасяліўся ў Віцебску і пачаў ствараць падпольныя групы. У сак. 1942 — ліст. 1943 узначальваў разведвальна-дыверсійную групу на варожым аэрадроме пад Віцебскам. Група забяспечвала партызанаў і часці Чырв. Арміі разведвальнымі звесткамі, склала і перадала план размяшчэння ваен. аб'ектаў ворага ў Віцебску, здабывала зброю і медыкаменты, рабіла дыверсіі (гл. *Віцебскае камуністычнае падполле*). З ліст. 1943 і да канца вайны Б. у дзейных часцях Сав. Арміі. Пасля вайны на савецкай і адм.-гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

БЕКМАНІЯ (Beckmannia), *вадзяны пырнік, зуброўнік*, род шматгадовых травяністых раслін сямейства злакавых. Выш. 50—150 *см*. Вядомы 2 віды: Б. ўсходняя і Б. звычайная. Пашыраны ў Паўн. і Усх. Еўропе, лясной і лесастэпавай зонах Азіі і Паўн. Амерыкі. У СССР найб. значэнне мае Б. звычайная. Выкарыстоўваецца на корм жывёле, дае ўраджай сена больш за 30 *ц/га*. Скошваюць да цвіцення (у фазе бутанізацыі). Найлепшыя ўраджаі Б. ў БССР дае на пізкіх і сырых месцах. Пры сяўбе патрэбна 10 *кг* насення на 1 *га*.

БЕК-НАЗАРАЎ Амо (Амбарцум) Іванавіч [19(31).5.1892, Ерэван — 27.4.1965], савецкі акцёр, рэжысёр кіно і сцэнарыст. Нар. арт. Арм. ССР (1935). З 1914 акцёр, з 1923 рэж. кіно. Адзін са стваральнікаў кінамастацтва Грузіі, Арменіі, Азербайджана. Лепшыя фільмы Б.-Н.— гістарычныя і экранізацыя твораў арм. класікі: «Намус» (1925), «Хас-Пуш» (1927), «Дом на вулкане» (1928), «Севіль» (1929), «Пэпо» (1935), «Зангезур» (1938, Дзярж. прэмія СССР 1941), «Давід-Бек» (1944), «Насрэдзін у Хаджэнце» (1959, з Э. Карамянам). Узнаг. 3 ордэнамі.


Тв.: Записки актера и кинорежиссера, М., 1965.

БЕКЮ Аўгуст (3.5.1771, Гродна — 26.7.1824), беларускі ўрач. Праф. (1806) мед. ф-та Віленскага ун-та. Айчым Ю. Славацкага. Вучыўся ў Гродне і Кёнігсберзе. У 1793 атрымаў ступені д-ра філасофіі і д-ра медыцыны ў Вышэйшай школе Літвы (з 1803 Віленскі ун-т), дзе з 1797 працаваў віцэ-праф. паталогіі, тэрапіі і фармакалогіі, а з 1806 праф. паталогіі, філасофіі і гігіены. Адзін з першых на Беларусі і ў Літве распачаў вакцынацыю супраць воспы. Асн. працы па шпітальнай справе і гігіене дзіцячага ўзросту. Удзельнік ліквідацыі патрыят. таварыства *філаматаў*.

Літ.: Bielinski J. Uniwersytet Wileński. 1579—1831, t. 1—2, Kraków, 1899—1900.

БЕЛ, лагарыфмічная адзінка вымярэння адносін энергій, магутнасцей, гукавых ціскаў. Назва паходзіць ад імя англ. вынаходніка тэлефона А. Бела (1847—1922). Абазначаецца *б* ці В. Ужываецца ў электратэхніцы, радыётэхніцы і акустыцы. Розніцу узроўняў дзвюх велічынь W_1 і W_2, якая адпавядае іх адносінам і колькасна роўная *N* Б., выражаецца формулай $N = \lg \frac{W_1}{W_2}$. На практыцы часта карыстаюцца дэцыбелам (0,1 Б.).

БЕЛААЗЕРСК, рабочы пасёлак у Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл. За 27 *км* на ПдУ ад Бярозы, 131 *км* ад Брэста, 19 *км* ад чыг. ст. Бронная Гара (на лініі Мінск — Брэст), ад якой праходзіць пад'язны чыг. пуць да Б.




Белааазерск. Агульны выгляд.

9,0 тыс. ж. (1969). Узнік па месцы вёскі Ніўкі ў 1960 у сувязі з буд-вам *Бярозаўскай ДРЭС*. Камбінат быт. абслугоўвання, хлебапякарня. Будуецца (1970) міжсістэмны рамонтна-механічны з-д для рамонту электраабсталявання. 2 сярэднія, рабочай моладзі, музычная школы, тэхн. вуч. электратэхнікаў; Дом культуры, 2 б-кі, 4 дзіцячыя сады-яслі, бальніца. На ПдЗ ад Б., каля воз. Белае, выяўлены старонкі чалавека часоў неаліту.

БЕЛАБАРОДАЎ Апанас Паўланцьевіч [н. 18(31).1.1903, в. Акіпіна-Баклашы Іркуцкага пав.], савецкі ваенны дзеяч, удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945), ген. арміі (1963). З сялян. Чл. КПСС з 1926. У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны, баёў на Кітайска-Усх. чыгунцы (1929). З восені 1942 камандаваў 5-м, потым 2-м гвардзейскім карпусамі, з 1944 — 43-й арміяй. Удзельнічаў у разгроме немцаў пад Масквой, у баях на Зах., Паўд.-Зах. франтах, пад Сталінградам. Вызначыўся ў *Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944*. Часці, якімі камандаваў Б., прарвалі варожыя абарончыя рубяжы, авалодалі ўмацаваным раёнам Сіроціна і ў ходу фарсіравалі Зах. Дзвіну. Байцы арміі, якою камандаваў Б., вызначыліся таксама ў крас. 1945 у час начнога штурму Кёнігсберга. У жн. 1945 на 1-м Далёкаўсходнім фронце камандаваў 1-й Чырванасцяжнай арміяй. З 1957 нач. Гал. ўпраўлення кадраў Мін-ва абароны СССР. З 1963 камандуючы войск Маскоўскай ваен. акругі, а 1968 ваен. інспектар Мін-ва абароны.

БЕЛАБЛОЦКІ Браніслаў (1861, в. Астрашын Слуцкага пав. Мінскай губ.— 14.4.1888), рэвалюцыянер-дэмакрат, сацыёлаг, літаратурны крытык. Са збяднелай шляхты. Скончыў Мінскую гімназію. Вучыўся на юрыд. ф-це Пецярбургскага ун-та і адначасова ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Удзельнічаў у рабоце гуркоў *«Народнай волі»*. На фарміраванне светапогляду Б. зрабілі ўплыў творы А. Герцэна, М. Чарнышэўскага, В. Бялінскага, М. Дабралюбава. З 1882 у Варшаве, супрацоўнічаў з дзеячамі партыі *«Пралетарыят»*, вёў рэвалюц. прапаганду. Друкаваўся ў «Przeglądzie Tygodniowym» («Штотыднёвы агляд») і час. «Ateneum» («Атэнеум»). У літ.-крытычных творах падкрэсліваў класавы характар л-ры, патрабаваў рэаліст. адлюстравання жыцця народа, заклікаў пісьменнікаў сваёй творчасцю служыць вызваленню працоўных. У сацыялагічных даследаваннях з марксісцкіх пазіцый крытыкаваў т. зв. арганічную тэорыю грамадства Г. Спенсера, падкрэсліваў, што рухаючай сілай грамадства з'яўляецца класавая барацьба. Удзельнік гуртка, які перакладаў «Капітал» К. Маркса на польскую мову.



Тв.: Szkice literackie. [Oprac.] L. Krzywicki, Warszawa, 1932; Szkice społeczne i literackie. [Oprac.] S. Sandler, Warszawa, 1954.

Літ.: Мальдзіс А. І. Верны вучань рэвалюцыйных дэмакратаў, «Літаратура і мастацтва», 1961, 21 ліст., № 92; Sandler S. U początków marksistowskiej krytyki literackiej w Polsce. Bronisław Białobłocki, Wrocław, 1954; Krzywicki L. Wspomnienia, t. 2, Warszawa, 1958.

С. А. Малевіч. Мінск.

БЕЛАБОЦКІ Ян Андрэй (г. н. і см. невяд.), філосаф і паэт 2-й пал. 17 ст. Скончыў Слуцкую кальвінісцкую гімназію, вучыўся ва ун-тах Зах. Еўропы. Кальвінісцкі прапаведнік у Слуцку, настаўнік у Магілёве. З-за праследаванняў езуітаў у 1681 пераехаў з Беларусі ў Маскву, дзе распаўсюджваў рацыяналістычныя і антыцаркоўныя ідэі. Царкоўны сабор прызнаў яго ерэтыком, прымусіў адмовіцца ад сваіх поглядаў і прыняць праваслаўе. У Маскве Б. займаўся перакладчыцкай і літ.-пед. дзейнасцю. Напісаў творы «Вялікая навука Раймунда Люлія», «Кніга філасофская», «Рыторыка», «Кароткая гутарка міласці з ісціпаю» і інш. Веру лічыў асабістай справай чалавека, не прызнаваў афіц. царквы, крытыкаваў Біблію. У яго філас. поглядах пераплятаюцца ідэі рацыяналізму, дэізму і пантэізму. Б. падкрэсліваў, што побач з богам вечна існуе прырода, сам бог — частка прыроды. Ставіў філасофію вышэй за багаслоўе, сцвярджаў, што магчымасці чалавечага розуму неабмежаваныя, адстойваў адзінства душы і цела. Асобныя творы Б. напісаны ў вершаванай форме. Галоўны — паэ-

ма «Пентатэугум, або Пяць кніг кароткіх...», у якім Б. ў рэліг. вобразах малюе сучаснае яму жыццё.

Літ.: Цветаев Д. Памятники к истории протестантства в России, ч. 1, М., 1888; Горфункель А. Х. Андрей Белобоцкий — поэт и философ конца XVII — начала XVIII в., у кн.: Труды отдела древнерусской литературы, т. 18, М.—Л., 1962; Подокшин С. А. Вольнодумец из Белоруссии Ян Белобоцкий, у кн.: Молодые ученые и современная философская наука, Мн., 1964.

С. А. Падокшын. Мінск.

БЕЛАБЯРЭЖСКАЯ РУДНЯ, вёска ў Вербавіцкім с/с Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл., на р. Славечна. Цэнтр калгаса «Усход». За 15 *км* на Пд ад Нароўлі, 196 *км* ад Гомеля, 16 *км* ад прыстані Нароўля на р. Прыпяць, 40 *км* ад чыг. ст. Ельск. 447 ж., двароў 141 (1970). Лясніцтва Нараўлянскага лясгаса, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, адда. сувязі, магазін.

БЕЛАВЕЖСКАЕ МІЖЛЕДАВІКОЎЕ, найстаражытнейшае міжледавікоўе ў раннім антрапагене, прамежак пацяплення паміж варажскім (беларускім) і бярэзінскім (верхнебярэзінскім, або окскім) ледавікоўямі. Адпавядае «міжледавікоўю другой паловы старажытнай эпохі» М. М. Цапенка і Н. А. Махнач (1959), венедскаму міжледавікоўю Г. І. Гарэцкага, тургяляйскаму міжледавікоўю Літвы, міжледавікоўю міндэль$_1$ — міндэль$_2$ альпійскай шкалы.

Назва была прынята Міжведамасным стратыграфічным камітэтам у 1963 па прапанове Л. М. Вазнячука, які за апорныя прыняў разрэзы з палеабатанічнай характарыстыкай адзінцоўскага (рослаўскага) міжледавікоўя. Спрод адкладаў Б. м. найбольш пашыраны венедскай алювіяльная світа пахаваных дадняпроўскіх далін і азёрныя, азёрна-балотныя і азёрна-ледавіковыя ўтварэнні лагчын ледавіковага выворвання і размыву. Магутнасць алювію, ад якога паставаліся пераважна пяскі рэчышчавай фацыі і пясчана-галечныя са жвірам адклады фацыі размыву, дасягае 30 *м*. Магутнасць азёрных і азёрна-балотных адкладаў (глінаў, суглінкаў, супескаў, пяскоў, торфаў) да 40—70 *м*. Клімат Б. м. быў умераны, халаднаваты, тыпу прыбалтыйскага, менш цёплы за клімат рослаўскага (шклоўскага), муравінскага і ліхвінскага міжледавікоўяў. У час кліматычнага оптымуму Б. м. на Беларусі раслі мяшаныя хваёва-дубовыя лясы з грабам, вязам, ліпаю, арэшнікам, з нязначнай прымессю елкі і піхты. На паліналагічных дыяграмах вылучаецца 3—5 фаз развіцця расліннасці. На некат. дыяграмах фазы кліматычнага оптымуму вылучэны невыразна. Найбольш поўныя дыяграмы Б. м. Беларусі склалі Н. А. Махнач (Мастки), З. М. Ананава (Сіўкова), В. А. Палазнік (Шчомысліца). Палеакарпалагічны комплекс Б. м., па даследаванні П. І. Дарафеева, характарызуецца на Беларусі прысутнасцю значнай колькасці экзотаў Azolla interglacialica Nikitin, Ranunculus sceleratoides Nikitin, Potamogeton sivkovense Dorof., P. vaginatus Turcz.

Літ.: Цапенко М. М. и Махнач Н. А. Антропогеновые отложения Белоруссии, Мн., 1959; Материалы по антропогену Белоруссии, Мн., 1961, с. 159—217.


БЕЛАВЕЖСКАЯ ГРАДА, на З Брэсцкай вобл., у межах Белавежскай пушчы і далей на У ад яе (Шарашова, Пружаны). Працягнулася дугой уздоўж рэк Нараўкі і Ясельды, выпуклая на Пд. Складаецца з ланцугоў пакатых узгоркаў да 20—30 *м* выш. (Казіная гара, г. Крамянёвая і інш.) марэннага паходжання. Прарэзваецца вытокамі р. Лясной (правы прыток Буга).

БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА, адзін з найстарэйшых лясных запаведнікаў Еўропы. У зах. частцы БССР на тэр. Гродзенскай і Брэсцкай абл. (70 *км* ад Брэста і 30 *км* ад Камяніца), уздоўж дзярж. граніцы і часткова (57 тыс. *га*) на тэр. ПНР. Назва ад замка Старая Белавежа (на тэр. ПНР). Былая паляўнічая гасп. польскіх каралёў (1410—1794) і рускіх цароў (1794—1914). Пастановай СНК БССР ад 25.12.1939 Б. п. (у межах БССР) абвешчана дзярж. запаведнікам. З 1957 дзярж. запаведна-паляўнічая гасп. Займае пл. 85 тыс. *га*. Цягнецца з Пн на Пд 65 *км*, з З на У ад 10 да 30 *км*. Найважнейшая задача Б. п. — аднаўленне і павелічэнне пагалоўя зуброў.


Рэльеф мясцовасці раўнінны, з невялікім узвышшам (да 205 *м* над узр. м.) у цэнтр. ч., ад якога адыходзіць невялікая града на ПдУ. Тут водападзел Нёмана, Зах. Буга, Прыпяці. Праз Б. п. цякуць рэкі Нараў, Нараўка, Рудаўка, Гвозна, Лясная, Белая. Глебаўтваральныя пароды — слабавалунныя суглінкі або супескі, падаслання марэнай. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя з ападзоленасцю розных ступені. Значную плошчу займаюць балотныя глебы, невялікую — глебы поймаў. Клімат умерана цёплы. Сярэднія гадавая т-ра 7,4 °С. Вегет. перыяд 200—210 дзён. Ападкаў калі 670 *мм* за год, найб. у вегет. перыяд. Снег трымаецца каля 70 дзён.

Кліматычныя і глебава-грунтавыя ўмовы спрыяюць развіццю дрэва-хмызняковай расліннасці (каля 900 відаў). Лес займае 86% тэр. Б. п. Пераважаюць хваёвыя (56%, мохавыя і чарнічныя) бары. Узрост лясоў да 160—180 гадоў, выш. дрэў 32—35 *м*; вабераліся адзінкавыя 200—350-гадовыя хвоі дыяметрам да 150 *см*. 11,4% пл. лясоў занята ельнікам, пераважна чарнічных і кіслічных тыпаў. Елка — самая высокая дрэвавая парода белавежскіх лясоў (да 50 *м* выш.). Пад дубнякамі 3,7% пл. лесу, узрост іх 170—200 гадоў. Ёсць 300—500-гадовыя дубы дыяметрам 150—190 *см*. Ускрай забалочаных поймаў рэк і па нізінных балотах расце алешнік (15,8% пл.). На ўзвышшах — клён, ясень, елка, добра развіты падлесак з чаромхі, ляшчыны, брыгліны, чорных парэчак, маліны; асабліва багатае (па складзе і развіцці) травяное покрыва. Пад бярэзнікам 10,5% пл. лясоў, у асн. на пераходных балотах. Асіна ў Б. п. амаль не ўтварае чыстых дрэвастояў (0,5%), трапляецца рэдка.


Б. п. адзіны ў Цэнтр. Еўропе лясны масіў, які збярогся да нашага часу ў амаль некранутым стане. Разнастайная расліннасць і мяккі клімат ствараюць добрыя ўмовы лясным жывёлам. Тут 55 відаў млекакормячых, больш за 200 відаў птушак, 11 відаў земнаводных, 7 відаў паўзуноў. Жыве на волі самы буйны і рэдкі прадстаўнік еўрап. фаўны — *зубр*. На пач. 19 ст. Б. п. — адзінае месца канцэнтрацыі зуброў, якія да таго часу былі вынішчаны амаль на ўсёй тэр. Еўропы. Закон 1803 забараніў паляванне на зуброў і лоўлю іх на тэр. казённых зямель, да якіх належала большая ч. пушчы. Была арганізавана падкормка зуброў і зніжэнне небяспечных для іх драпежнікаў. Шмат зуброў утрымлівалася ў спец. вялікіх загародках. Паводле афіц. звестак рост пагалоўя зуброў



1



2



3



4

Белавежская пушча I.

1. Цэнтральная сядзіба запаведніка. 2. Запаведны лес. 3. Зубры. 4. Высакародныя алені. 5. Турухтаны. 6. Зайчаняты.



5



6















Белавежская пушча II.

1. Дуброва ялова-грабова-арляковая.
2. Каня.
3. Аленяняты.
4. Дзікая свіння з парасятамі.
5. Тарпаны.
6. Вожык.
7. Вуж і сажалкавая жаба.

паступны: у 1824 — 500, 1830 — 700, 1840 — 817, 1850 — 1560, у 1860 — 1575. З 60-х г. 19 ст. колькасць зуброў зноў стала меншаць і ў 1910 іх было толькі 700. Зубры вадзіліся таксама ў лясах Зах. і Цэнтр. Еўропы і на Каўказе, але на пач. 20 ст. асталіся на волі толькі ў Б. п. і ў вярхоўях Кубані. У 1-ю сусв. вайну пачалося знішчэнне гэтых рэдкіх жывёл. Апошні зубр застрэлены ў 1921, у 1927 знішчаны і апошні каўказскі. У 1929 з заапаркаў Еўропы ў Б. п. завезлі некалькі зуброў, з іх пачалося аднаўленне гэтага віду. У 1941 іх было 19. У час фаш. нашэсця частку зуброў знішчылі акупанты, і толькі з вызваленнем Беларусі пачалося ўзнаўленне статка. У выніку аховы і біятэхнічных мерапрыемстваў колькасць зуброў павялічылася да 70 (1968). Усяго ў Б. п. (па бел. і польскай тэр.) іх больш за 200 (1969). *Высакародных аленяў* у пушчы каля 2 тыс. (1969). Колькасць іх то павялічвалася да 3—5 і нават да 7 тыс. (перад 1-й сусв. вайной), то памяншалася да некалькіх дзесяткаў. Водзяцца казулі (больш за 1,5 тыс., 1969). У паўн., найб. забалочанай частцы Б. п. жыве лось. Трымаецца ён маладых лясоў, багатых на корм. У Б. п. ў пач. 18 ст. завезена з паркавых гасп. Еўропы *лань* (даніэль), знішчаная ў 1-ю сусв. вайну. Па ўсёй Б. п. сустракаецца дзік (больш за 2 тыс., 1968). Вадзіліся *тур* і дужы выносліны лясны конь — *тарпан*. Тур знік у 17, тарпан — у 19 ст. У 1962 і 1968 з ПНР завезена 5 тарпанаў. Самы буйны з драпежнікаў — буры мядзведзь знішчаны ў сярэдзіне 19 ст., воўк бывае толькі заходамі. Трапляецца рысь, але яе нямнога (20—30 жывёлін). Водзяцца: тхор, ласка, гарнастай, ліс, барсук, сустракаецца куніца. За апошнія два дзесяцігоддзі распладзіўся янотападобны сабака. Па лясных рэках і ручаях жывуць выдра, бабёр. У старых лясах, на палетках, палянах шмат зайцоў-русакоў, у хвойных лясах — вавёркі. Самыя шматлікія грызуны — мышы (жаўтагорлая, лясная і палявая), палёўка-эканомка, шэрал, цёмная і вадзяная палёўкі, лясная мышоўка. З насякомаедных — звычайны крот і землярыйкі. 13 відаў лятучых мышэй. У Б. п. багатая і разнастайная фаўна птушак. Трапляюцца тыповыя зах. віды (чырвоны каршун, канарэйкавы ўюрок), паўн. таежныя (трохпальцы дзяцел, гіль, даўгахвостая пяясыць) і птушкі паўн. шыракалістых лясоў (зялёны дзяцел, беласпінны і сярэдні стракатыя дзятлы, драздападобная чарацянка, ястрабовая валасянка). Водзіцца 20 відаў драпежных птушак; шмат баравой дзічыны, асабліва рабчыкаў. Самая большая ў БССР колькасць глушцоў. Гняздуецца *чорны бусел*. Завезены *фазаны*.

Б. п. здаўна прыцягвала ўвагу многіх даследчыкаў прыроды. Тут працавалі вядомыя лесаводы Н. К. Генка, Ю. К. Пачоскі, заолагі М. М. Кулагін, С. А. Северцаў, вучоныя нашага часу І. Д. Юркевіч, В. К. Захараў, С. С. Тураў, І. І. Сакалоў, А. Р. Банікаў, В. Ф. Гаўрын і інш. Б. п. — унікальны помнік прыроды і н.-д. ўстанова. Разнастайнасць яе прыроды вывучаюць супрацоўнікі навук. аддзела пушчы — спецыялісты розных галін біял. навукі (геабатанікі, дэндролагі, глебазнаўцы і заолагі), а таксама студэнты ВНУ, якія праходзяць тут навуч. практыку. У Б. п. атрыманы каштоўныя матэрыялы па рацыянальным выкарыстанні і ахове прыродных багаццяў краю, праведзены работы па класіфікацыі дрэвастою, флоры, марфалогіі і экалогіі лася, аленя, дзіка, казулі, птушак, лятучых мышэй і мышападобных грызуноў, па экалогіі і ўтрыманні зуброў, расплоджванні фазанаў. Экалогію вадаплаўных птушак вывучаюць на Выганаўскім возеры (філіял Б. п. з 1959, пл. 8351 *га*). Вынікі даследаванняў публікуюцца. Добра абсталяваны музей знаёміць турыстаў з гісторыяй і сучасным станам запаведніка. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Карцов Г. П. Беловежская пуща, СПб., 1903; Беловежская пуща, Мн., 1968; Банников А. Г. По заповедникам Советского Союза, М., 1966; Юркевич И. Д. и Гельтман В. С. География, типология и районирование лесной растительности Белоруссии, Мн., 1965; Северцов С. А. Беловежская пуща, «Природа», 1940, № 10; Кестер Б. В. и Шостак С. В. Прошлое и настоящее Беловежской пущи, М., 1968; Беловежская пуща. Исследования, в. 1—3, Мн., 1958—69 (в. 1 пад назвай: Труды Заповедно-охотничьего хозяйства. Беловежская пуща).

У. С. Раманаў. Мінск.

БЕЛАВО́КІ НЫРЭ́Ц (Aythya nyroca), птушка сямейства качыных атрада гусепадобных. Маса каля 500 *г*, даўж. крыла 17—19 *см*. Апярэнне зверху рыжавата-карычневае (спіна і падхвосце амаль чорныя). Бруха, падхвосце і люстэрка на крылах белыя. Пашыраны на Пд Еўрап. часткі СССР, у Зах. Сібіры, на Каўказе, у Казахстане і Сярэд. Азіі. На Беларусі паяўляецца на пралёце, гняздуецца рэдка (пар. назва чарнушка), жыве на вадаёмах з зараснікамі. Нясе 7—12 яец. Корміцца расліннай ежай, малюскамі, ракападобнымі, лічынкамі водных насякомых.

БЕЛАВО́ЧКА, кля́пец (Abramis sapa), рыба сямейства карпавых. Блізкая да ляшча. Даўж. каля 30 *см*, маса да 0,8 *кг*. Водзіцца ў рэках басейнаў Чорнага, Азоўскага, Каспійскага і Аральскага м., у Волхаве. На Беларусі — у Дняпры і вялікіх яго прытоках. Нерастуе на 4—5-м годзе жыцця, звычайна ў крас.— чэрв. Кладзе 35—100 тыс. ікрынак. Корміцца лічынкамі насякомых, малюскамі.

БЕЛАВУ́САВА Ева Сільвестраўна (н. 13.5.1925, в. Лабанаўка Чэрыкаўскага р-на Калінінскай акр.), перадавік вытворчасці, Герой Сац. Працы (1960). Чл. КПСС з 1964. З 1948 прадзільшчыца Магілёўскага з-да штучнага валакна імя Куйбышава.

БЕЛАВУСАЎ Андрэй Мінавіч [н. 20.9(2.10).1896, в. Хадасевічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], удзельнік Айч. вайны, кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Да вайны працаваў у калгасе. На фронце з чэрв. 1944, сапёр. Вызначыўся пры прарыве абароны ворага. 14.1.1945 зняў 42 варожыя міны. У лют. 1945 перапраўіў байцам цераз Одэр 400 скрынак боепрыпасаў, 1,5 *т* прадуктаў. 10.3.1945 з групай байцоў зрабіў 2 праходы

ў мінных палях, а ў час наступлення на захопленым рубяжы паставіў 150 мін. 15 і 16.4.1945 зрабіў праходы ў мінных палях, зняў 30 мін; разміраваў шашу ў напрамку г. Франкфурт-на-Одэры, зняў 32 міны. 25.4. 1945 удзельнічаў у пабудове моста цераз канал, што забяспечыла своечасовы праход сав. тэхнікі. Жыве ў калгасе «Новы шлях» Рагачоўскага р-на.

БЕЛАВУСАЎ Канстанцін Міхайлавіч [н. 3(16).3.1907, в. Юсцінава Себежскага пав. Віцебскай губ.], адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. З 1929 у Чырв. Арміі. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). Полк, у якім служыў Б., 27—29.6.1941 удзельнічаў у абароне Мінска. З групы салдатаў і афіцэраў, што трапілі ў акружэнне, і мясцовага насельніцтва Б. арганізаваў і ўзначаліў партыз. атрад. З 15.7.1941 атрад дзейнічаў у Мінскай, потым у Магілёўскай абл. З ліп. 1943 Б. камандаваў Ваенна-аператыўнай групай (ВАГ), потым камандзір *партызанскай брыгады № 113*. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

БЕЛАВУСАЎ Павел Кірылавіч [н. 15(28).8. 1915, г. Вялікі Такмак Екацярынаслаўскай губ.], беларускі савецкі скульптар. Скончыў Варашылаўградскае маст. вучылішча (1938). У 1942—45 на фронце. З 1945 жыве на Беларусі. У 1945—55 удзельнічаў у скульптурным афармленні новабудоўляў Мінска (жылыя дамы на Прывакзальнай пл., будаўнічы тэхнікум, Дзярж. маст. музей БССР і інш.).



П. К. Белавусаў. Апошні бастыён. 1958.

Асн. работы: «Партызан на допыце» (1951), «Дзе ж вы цяпер, сябры-аднапалчане?» (1954), «Паўстанец», «Варатар» (1957), «Апошні бастыён» (1958), партрэт У. Маякоўскага (1963), «Салдаты 1941 г.» (1964), помнік У. І. Леніну (1969, Бабруйск).

БЕЛАВУСАЎ Уладзімір Уладзіміравіч [н. 17(30).10.1907, Масква], савецкі геолаг-тэктаніст. Чл.-кар. АН СССР (1953). Праф. геалогіі МДУ (1953). Заг. аддзела геадынамікі Ін-та фізікі Зямлі АН СССР (1943). Прэзідэнт Міжнар. геад. і геафіз. саюза (1960—63). Прэзідэнт Міжнар. камітэта па праекце «Верхняя мантыя Зямлі» (1963). Чл. Шведскай і Нью-Йоркскай АН. Працы Б. па праблемах тэктонікі, тэктонафізікі, структурнай геалогіі. Распрацаваны ім метад фацый і магутнасцей шырока ўжываецца пры геатэктанічным аналізе тэр. ў геал. даследаваннях. Аўтар геатэктанічнай гіпотэзы, у аснову якой пакладзена ўяўленне пра дыферэнцыяцыю рэчыва Зямлі пад уплывам яго разагравання і выплаўлення адносна лёгкіх фракцый.

Тв.: Фации и мощности осадочных толщ Европейской части СССР, «Труды Института геологических наук АН СССР», 1944, в. 76; Основные вопросы геотектоники, 2 изд., М., 1962; Земная кора и верхняя мантия материков, М., 1966; Земная кора и верхняя мантия океанов, М., 1968.

БЕЛАВУША, вёска ў Столінскім р-не Брэсцкай вобл., на р. Гарынь. Цэнтр сельсавета і калгаса «Перамога». За 7 *км* на ПнУ ад Століна, 254 *км* ад Брэста, 14 *км* ад чыг. ст. Гарынь, на шашы Давыд-Гарадок — Столін. 3520 ж., двароў 881 (1970). Аддз. рыбгаса «Лахва». Сярэдняя і пач. школы, клуб, 2 б-кі, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, 5 магазінаў. У 1918—19 жыхары вёскі ўдзельнічалі ў паўстаннях супраць немцаў, пятлюраўцаў і белапалякаў.

БЕЛАГАЛОВЫ СІП (Gyps fulvus), птушка атрада драпежных. Даўж. да 1,2 *м*, размах крылаў да 2,6 *м*, маса каля 7,5 *кг*. Галава і шыя ўкрыты шчыльным белаватым пухам. З асновы шыя абкружана шырокім ашыйнікам з густога пуху, у маладых птушак — з рассуканага пер'я. Апярэнне зверху буравата-палевае, знізу цямнейшае. Пашраны ў Афрыцы, Паўд. Еўропе, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі. Залятае далёка на Пн ад месцаў гнездавання. У час такіх залётаў бывае на Беларусі. Гняздуецца невялікімі калоніямі на скалах або дрэвах. Нясе 1 вялікае белае яйцо. Наседжвае 50 дзён. Корміцца мярцвячынай.

БЕЛАГРУДА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Дзітва. Цэнтр сельсавета. За 17 *км* на ПдЗ ад Ліды, 94 *км* ад Гродна, 2 *км* ад чыг. ст. Белагруда. 77 ж., двароў 18 (1970). Васьмігадовая школа, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, магазін.

БЕЛАГУРНА, вёска ў Мяляхавіцкім с/с Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Моўчадзь. Цэнтр саўгаса «Мяляхавічы». За 28 *км* на ПдУ ад Дзятлава, 210 *км* ад Гродна, 5 *км* ад чыг. ст. Выгада. 131 ж., двароў 38 (1970). Палац культуры, б-ка, магазін, парк імя 50-годдзя Сав. улады. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЕЛАДОННА, тое, што і *красаўка*.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Пыранкі, правага прытока Котры, у Гродзенскім р-не. Пл. 7,1 *км*². Даўж. 13,0 *км*, сярэдняя шыр. 0,55 *км*. Катлавіна стужкападобная, выцягнута ў мерыдыянальным кірунку. Схілы тэрасаваныя, выкарыстоўваюцца пад ворыва або ўкрыты хмызняком. Дно воз. на найб. глыбіні ўслана краменязёмістымі аліўкавага колеру сапрапелямі. Вадазбор (267 *км*²) раўнінны, складзены з марэнных суглінкаў і супескаў. Воз. эўтрофнага тыпу, зарастае. Праточнае, праз Б. працякае р. Пыранка, якая пачынаецца з воз. Малочнае. Водзяцца шчупак, акунь, лешч, карась, краснапёрка, плотка і інш.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Бялевіцы, правага прытока канала Дзегцяроўка, у Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 5,5 *км*². Даўж. 3 *км*, найбольшая шыр. 2,7 *км*, сярэдняя 1,8 *км*, найбольшая глыб. 6 *м*. Катлавіна круглявая. Дно пераважна плоскае, пясчана-ілістае (тоўшча ілу на глыбакаводных месцах да 6 *м*). Вадазбор (31,6 *км*²) дробнаўзгорысты. На ПдЗ у воз. ўпадае ручай, на ПнУ пратокай злучаецца з воз. Лісна. Б. эўтрофнага тыпу, моцна зарастае. Водзяцца лешч, акунь, шчупак, плотка.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Ясельды, левага прытока Прыпяці, у Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл. Пл. 5,06 *км*². Даўж. 3,4 *км*, сярэдняя шыр. 1,5 *км*, найб. глыб. 3,2 *м*, сярэдняя 1,6 *м*. Катлавіна круглявая. Схілы спадзістыя, выш. 2—4 *м*; берагі забалочаныя, выш. 0,5 *м*. Ложа воз. плоскае, услана апясчаненым ілам. Эўтрофнага тыпу, зарастае. Палоса трысняг у і чароту ўздоўж берагоў месцамі змяняецца ўчасткамі рдзестаў. Вадазбор (59 *км*²) плоскі, дзюпна-ўзгорысты, месцамі забалочаны. Злучана канавай з Ясельдай, каналам з воз. Чорнае. На беразе Б. Бярозаўская ДРЭС. Водзяцца карась, лінь, шчупак, плотка, акунь.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Свольны, правага прытока Дрысы, у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,73 *км*². Даўж. 2,5 *км*, сярэдняя шыр. 1,1 *км*. Вадазбор (8,53 *км*²) узгорыста-марэнны. Воз. слаба зарастае. Водзяцца плотка, шчупак, судак, акунь і інш.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Обаль, правага прытока Зах. Дзвіны, на Пн Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. Пл. 2,4 *км*². Даўж. 2,8 *км*, сярэдняя шыр. 0,8 *км*, найбольшая глыб. 7,9 *м*, сярэдняя 4,3 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы спадзістыя, выш. 2—5 *м*, укрыты лесам. Берагі нізкія (0,2—0,3 *м*), месцамі забалочаныя, з луга-балотнай расліннасцю. Дно пясчана-ілістае. Вадазбор (6,0 *км*²) марэнна-ўзгорысты. Б. эўтрофнага тыпу, злучана пратокай з воз. Чорнае. Водзяцца лінь, карась, шчупак, акунь, плотка.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Чарнагосніцы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Віцебскім р-не. Пл. 1,66 *км*². Даўж. 6,3 *км*, сярэдняя шыр. 0,26 *км*. Вадазбор (10,8 *км*²) — слаба перасечаная раўніна. Б. на Пд злучана пратокай з воз. Заазер'е, на Пн — з Астровенскім.

БЕЛАЕ, возера ў бас. Прыпяці, у Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл. Пл. 1,56 *км*². Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор забалочаны. Воз. праточнае.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Чарнец, якая ўпадае ў воз. Свіно (бас. Обалі), у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,36 *км*². Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор дробнаўзгорысты. Воз. злучаецца пратокамі з азёрамі Чорнае, Звярынае, Воўчына. Зарастае. Водзяцца лінь, карась, шчупак, плотка, акунь.

БЕЛАЕ, возера, вытак р. Дахнаркі, левага прытока Дрысы, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,18 *км*². Даўж. 1,2 *км*, сярэдняя шыр. 0,9 *км*. Катлавіна круглявая. Рэльеф вадазбору (40,3 *км*²) нізінны. Воз. зарастае. Злучана пратокай з воз. Чорнае.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Дахнаркі, левага прытока Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), каля в. Белае, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,16 *км*². Даўж. 1,7 *км*, сярэдняя шыр. 0,68 *км*. Вадазбор (2,62 *км*²) — слаба перасечаная раўніна, зах. частка занята лесам і забалочаная. Б. злучана з воз. Дахнарскае.

БЕЛАЕ (Беланы-Эзерс), возера ў бас. р. Дзісны, левага прытока Зах. Дзвіны, на мяжы БССР (Браслаўскі р-н) і Латв. ССР. Пл. 0,92 *км*². Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Дно ілістае, укрыта краменязёмістымі аліўкавымі сапрапелямі. Вадазбор (7,0 *км*²) дробнаўзгорысты, складзены з марэнных суглінкаў і супескаў. Воз. эўтрофнага тыпу, слаба зарастае. Водзяцца акунь, шчупак, лешч, лінь.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Свячы, правага прытока Улы (бас. Зах. Дзвіны), у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,83 *км*². Вадазбор (7,0 *км*²) нізінны. Воз. сцёкавае.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Дабрылаўкі, правага прытока р. Бярозаўкі (бас. Зах. Дзвіны), у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,63 *км*². Даўж. 1,7 *км*, сярэдняя шыр. 0,37 *км*. Вадазбор (13,5 *км*²) узгорысты, перасечаны, месцамі зарос лесам. Злучана ручаём з Дабрылаўкай.

БЕЛАЕ, возера ў бас. Зах. Дзвіны, каля в. Пушкары, у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Даўж. 2,3 *км*, найбольшая шыр. 0,45 *км*, сярэдняя 0,25 *км*, найбольшая глыб. 22 *м*, сярэдняя 6,4 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы парэзаны ярамі; берагі нізкія, затарфаваныя, укрытыя лугавой расліннасцю. Рэльеф вадазбору (6,29 *км*²) пераважна марэнны спадзістахвалісты. Воз. эўтрофнага тыпу, зарастае. Злучана ручаём з воз. Гародна. Водзяцца шчупак, лешч, карась, верхаводка.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Шошы (бас. Зах. Дзвіны), на ПдУ ад воз. Шо, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Даўж. 2 *км*, сярэдняя шыр. 0,29 *км*. Вадазбор (23,3 *км*²) — плоская раўніна, паўд. частка занята лесам і часткова забалочаная.

БЕЛАЕ, возера, вытак р. Іспол, левага прытока р. Дрысы, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Даўж. 1,4 *км*, сярэдняя шыр. 0,4 *км*. Вадазбор (4,08 *км*²) нізінны, месцамі забалочаны.

БЕЛАЕ, возера ў бас. р. Волты, левага прытока Зах. Дзвіны. Размешчана на балоце Мох у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,54 *км*². Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор (11,0 *км*²) нізінны, забалочаны.

БЕЛАЕ, вёска ў Нястанавіцкім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Валадарскага. За 43 *км* на ПнЗ ад Лагойска, 83 *км* ад Мінска, 50 *км* ад чыг. ст. Вілейка. 142 ж., двароў 47 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БЕЛАЕ, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., на паўн.-ўсх. беразе Белага Малога воз. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Белае». За 18 *км* на ПнЗ ад Полацка, 120 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. ст. Баравуха 1-я, на шашы Полацк — г. п. Асвея. 559 ж., двароў 188 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэд. школа, клуб, б-ка, урачэбны ўчастак, дзіцячы сад і яслі, аддзяленне сувязі, сталовая, 2 магазіны.

БЕЛАЕ БАЛОТА, вёска ў Чарнянскім с/с Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Рэчыца». За 7 *км* на Пн ад Рэчыцы, 50 *км* ад Гомеля, 8 *км* ад чыг. ст. Сеназавод. 667 ж., двароў 175 (1970). Сярэдняя школа, клуб, дзіцячы сад і яслі, мед. пункт.

БЕЛАЕ ВОЗЕРА, на З Валагодскай вобл. РСФСР. Пл. 1125 *км*², глыб. каля 4 *м*. У воз. ўпадаюць рэкі: Коўжа (суднаходная), Кема, Мягра. Ледастаў з лістапада да канца красавіка. З Б. в. выцякае р. Шэксна. Уздоўж паўд. і зах. берагоў Белазерскі абводны канал — частка Волга-Балтыйскага воднага шляху імя Леніна.

БЕЛАЕ ВЯЛІКАЕ, возера ў бас. р. Дражбіткі, левага прытока р. Сосніцы (бас. Зах. Дзвіны), у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,42 *км*². Даўж. 2,8 *км*, слрэдняя шыр. 0,5 *км*. Вадазбор (10,2 *км*²) — забалочаная, укрытая лесам нізіна. Б. В. злучана канавай з воз. Гваздок.

БЕЛАЕ МАЛОЕ, возера ў бас. р. Дражбіткі (бас. Зах. Дзвіны), у Полацкім р-не Віцебскай вобл., каля в. Белае. Пл. 1,0 *км*². Даўж. 2,2 *км*, слрэд. шыр. 0,45 *км*. Вадазбор (2,4 *км*²) — забалочаная, заросшая лесам нізіна.

БЕЛАЕ МОРА, унутрыматерыковае мора Паўн. Ледавітага акіяна. Глыбока ўдаецца ў сушу паміж Кольскім і Канінам п-вамі. Мяжа з Баранцавым м. паміж мысамі Святы Нос — Канін Нос. Пл. 90 тыс. *км*². Найбольшая глыб. 330 *м* у зах. частцы, усх. больш мелкаводная (30—120 *м*). Губы (заліны): Кандалакшская, Анежская, Дзвінская, Мязеньская. Самыя вялікія а-вы: Салавецкія, Маржавец, Мудзьюгскі, Мягостраў. Берагі высокія, скалістыя, моцна парэзаныя. Рэльеф дна няроўны, шмат упадзін і жалабоў, якія чаргуюцца з мелямі і банкамі. У Б. м. ўпадаюць рэкі Паўн. Дзвіна, Анега, Мязень, Паной. Клімат халодны, на Пд умерана халодны. Т-ра паверхневых водаў летам 7—15 °С, салёнасць адпаведна 30,0—30,8‰ на Пн, 20—26‰ на Пд. З лістапада да мая ўкрыта дрэйфуючым (у бухтах суцэльным) лёдам. З Б. м. ў Баранцава м. існуе пастаяннае цячэнне. Б. м. багатае на рыбу (селядзец, сёмга, навага, траска), промысел цюленяў. Порты: Архангельск, Анега, Беламорск, Кандалакша, Мязень.

БЕЛАЕ СВЯТЛО, складанае электрамагнітнае выпрамяненне з даўжынёй хваляў 0,4—0,76 *мкм*, якое выклікае ў вачах чалавека пейтральнае адчуванне колеру. Натуральныя крыніцы Б. с.— выпрамяненне Сонца і большасці зорак, цвёрдых целаў, вадкасцей і газаў (пры высокім ціску), нагрэтых да тэмператур, блізкіх да т-ры Сонца (6000 К). Штучныя пецеплавыя крыніцы Б. с.— люмінесцэнтныя лямпы.

Б. с. можна атрымаць змешваннем святла некалькіх колераў (напр., вялёнага, чырвонага і фіялетавага). З дапамогай *спектральных прылад* Б. с. раскладаецца ў спектр, які ў выпадку выпрамянення Сонца і вораг мае выгляд неперарыўнага (суцэльнага) спектра з асобнымі лініямі паглынання. У спектрах выпрамянення нагрэтых цвёрдых целаў і вадкасцей лініі паглынання няма. Суцэльнаму спектру люмінесцэнтных лямпаў уласцівы асобныя лініі спрамянення. Максімум энергіі ў выпрамяненні Сонца прыпадае на 0,5 *мкм*, г. зн. практычна супадае з максімумам крывой бачнасці чалавечага вока (0,56 *мкм*). Прыёмнік Б. с. з колернай адчувальнасцю, блізкай да адчувальнасці вока,— ортахраматычная фотапласцінка ў спалучэнні з жоўтым светафільтрам. Б. с. матэматычна апісваецца наборам сінусаідальных эл.-магн. хваляў ці перыядычных імпульсаў (груп хваляў). Кожнаму адвольна малому ўчастку спектра адпавядае група эл.-магн. хваляў, што не дазваляе выдзяліць з Б. с. строга монахраматычнага выпрамянення.

Літ.: Дитчберн Р. Физическая оптика, пер. с англ., М., 1965. *В. С. Бураков.* Мінск.



БЕЛАЗЁРСКІ Андрэй Мікалаевіч [н. 16(29).8.1905, Ташкент], савецкі біяхімік, адзін з заснавальнікаў малекулярнай біялогіі ў СССР. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1958). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Сярэднеазіяцкі дзярж. ун-т у Ташкенце (1927). Праф. (1946), заг. кафедры біяхіміі раслін Маскоўскага дзярж. ун-та (з 1960). Даследаваў біяхімію нуклеінавых к-т і нуклеапратэідаў. Даказаў паяўнасць ДНК у клетках вышэйшых і нізэйшых раслін; зрабіў вывад пра адзінства хім. саставу ядравага рэчыва раслін і жывёл. Выявіў відавую спецыфічнасць нуклеінавых к-т, давёў, што існуе сувязь яе са спадчыннасцю арганізмаў і іх філагенезам. Пад кіраўніцтвам Б. даследаваны новыя антыбіётыкі актынаміцэтнага паходжання, механізм біясінтэзу бялку, высветлены заканамернасці фосфарнага абмену ў раслін. Б.— гал. рэдактар час. «Успехи современной биологии», чл. Камітэта па Ленінскіх і Дзярж. прэміях пры Савеце Міністраў СССР, удзельнік Міжнар. біяхім. канграсаў у Францыі (1952), Бельгіі (1955), Аўстрыі (1958), СССР (1961). Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўн. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Нуклеопротеиды и нукленновые кислоты растений и их биологическое значение, М., 1959; Нукленновые кислоты и их биологическое значение, М., 1963.

БЕЛАЗЕРЦАЎ Васіль Дзмітрыевіч (н. 10.6.1923, в. Шукаўка Варонежскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1945. На фронце з 1941. Вызначыўся ў баі на тэр. Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. 5.10.1943 разлік гарматы, якім камандаваў малодшы сяржант Б., адбіў атаку танкаў на адкрытай пазіцыі. Сам Б., стаўшы да гарматы замест параненага наводчыка, падпаліў 2 танкі. Служыць у Сав. Арміі.

БЕЛАЗУБКІ (Crocidura), род млекакормячых атрада насякомаедных. Нагадваюць мышэй. Даўж. 50—100 *мм*, хвост каля 30 *мм*. Вушы параўнальна вялікія, зубы белыя (адгэтуль назва), на хвасце рэдкія доўгія валаскі. Шкурка зверху цёмна-бурая, знізу светлая, амаль белая. Пашыраны ў Еўропе, Азіі і Афрыцы. Вядома 9 відаў, у БССР 2. Б. — карысныя звяркі, знішчаюць шкодных насякомых.



Малая белазубка.

БЕЛАКАПЫТНІК (Petasites), род шматгадовых травяністых раслін сямейства складанакветных. Кветканоснае сцябло ўкрыта лускаватым лісцем. Выш. да 70 *см*. Прыкаранёвае лісце вялікае, круглавата-сэрцападобнае, няроўна-зубчастае. Кветкі духмяныя, брудна-пурпуровыя, белавата-жоўтыя або чырвоныя. Суквецці — кошыкі, сабраныя ў гронкі або ў шчыткі. Вядома 15 відаў, пашыраных у Еўропе і Азіі. На Беларусі 2 віды: Б. гібрыдны (P. hybridus, пар. назвы: маткавік лекавы, цартрава) і Б. несапраўдны (P. spurius, пар. назва балотная пастрэлка). Растуць па сырых месцах, па берагах рэк, азёраў, сажалак. Ужываецца ў пар. медыцыне.



Белакапытнік гібрыдны.

БЕЛАКОЗ Адольф Сцяпанавіч (каля 1826, маёнтак Лешна Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ.— 1895), удзельнік паўстання 1863 на Беларусі і ў Польшчы. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі. Служыў у Гродзенскай палаце цывільнага суда. На пач. 60-х г. жыў у Беластоку, даваў урокі музыкі. Актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання, надрукаваў (з Б. Шварцэ) у беластоцкай падпольнай друкарні некалькі рэвалюц. выданняў, у т. л. *«Гутарку старога дзеда»*. З пач. 1863 паўстанцкі начальнік Беластока. У чэрв. 1863 арыштаваны і высланы ў Пермскую губ., праз год прыгаворам ваеннага суда сасланы ў Сібір.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

БЕЛАКОРАЦ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. на р. Іслач. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны партызан». За 10 *км* на Пд ад Валожына, 85 *км* ад Мінска, 28 *км* ад чыг. ст. Валожын. 253 ж., двароў 84 (1970). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, мед. пункт, аддз. сувязі. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЕЛАКУДРАЙНІК (Ballota), род шматгадовых траў, радзей паўкустоў і кустоў сямейства губакветных. Сцябло шурпатаапушанае, выш. 20—125 *см*. Лісце круглавата-яйцападобнае, пілаватае. Кветкі блакітна-ружовыя або чырвона-фіялетавыя, радзей белыя, у пазушных паўпарасоніках. Вядома больш за 30 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. У СССР 4 віды, у БССР адзін — Б. чорны (B. nigra, нар. назва чорная шапка). Расце каля дарог, на пустках, засмечаных мясцінах. Непрыемна пахне. Ужываецца ў нар. медыцыне.



Белакудранік чорны.

БЕЛАКУРАЎ Уладзімір Вячаслававіч [н. 25.6(8.7).1904, с. Ніжні Услон Казанскай губ.], рускі савецкі акцёр. Нар. арт. СССР (1965). Праф. (1946). Творчую дзейнасць пачаў у 1918. У 1924—36 акцёр т-ра імя Рэвалюцыі, з 1936 — МХАТа. Вострая характарнасць, дакладная лепка вобраза, уменне выявіць яго сац. і псіхалаг. аснову ўласціва мастацтву Б. З роляў: Белагубаў («Даходнае месца» А. Астроўскага), Чычыкаў («Мёртвыя душы» паводле М. Гогаля), Рыгор («Плён асветы» Л. Талстога). З 1932 здымаецца ў кіно («Валерый Чкалаў» і інш.), у т. л. ў фільмах бел. студыі: «Масква — Генуя» (1964), «Праз могілкі» (1965), «Альпійская балада» (1966), «Я родам з дзяцінства» (1967). З 1934 займаецца пед. дзейнасцю. Дзярж. прэмія СССР 1951. Узнаг. двума ордэнамі, медалямі.

БЕЛАЛОБАЯ ГУСЬ (Anser albifrons), вадаплаўная птушка атрада гусепадобных. Маса да 3 *кг*, даўж. крыла каля 40 *см*. Апярэннем нагадвае шэрую гусь, але спіна цямнейшая, на грудзях і бруху вялікія чорныя плямы, лоб белы. Жыве ў тундры. На Беларусі бывае на пралёце.

БЕЛА — МАЖАНДЗІ ЗАКОН, асноўная заканамернасць размяшчэння рухальных і адчувальных валокнаў у нервовых карэньчыках спіннога мозгу, паводле якой адчувальныя (цэнтраімклівыя) валокны змешаных спіннамазгавых нерваў уваходзяць у спінны мозг у складзе задніх карэньчыкаў, а рухальныя (цэнтрабежныя) выходзяць з яго ў складзе пярэдніх карэньчыкаў. Адкрыты ў 1822 франц. фізіёлагам Ф. Мажандзі. Заснаваны на даследаваннях шатл. фізіёлага Ч. Бела. На думку некаторых вучоных, не абсалютны.

Літ.: Кроль М. Б. и Федорова Е. А. Основные невропатологические синдромы, М., 1966; Бериташвили И. С. Общая физиология мышечной и нервной системы, 3 изд., т. 2, М., 1966.

БЕЛАМЕСНЫХ Уладзімір Карнілавіч [н. 27.6(10.7).1913, в. Баргадай Зімінскага пав. Іркуцкай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1940. На фронце з лютага 1943. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на Пд ад Лоева Гомельскай вобл. 15.10.1943 пад варожым агнём пераправіў на лодцы на зах. бераг 185 сав. салдатаў са зброяй і боепрыпасамі. Жыве ў Сочы.

БЕЛАМОРСКА-БАЛТЫЙСКІ КАНА́Л, суднаходны канал, які злучае Белае мора (каля г. Беламорска) з Анежскім воз. (каля г. п. Павянец). Пабудаваны ў 1931—33. Даўж. 227 *км*, у т. л. штучны водны шлях 37,08 *км*. Мае 19 шлюзаў, 15 плацін, 49 дамбаў і інш. гідратэхн. збудаванні. Навігацыя з сярэдзіны мая да канца кастрычніка. Праз Анежскае воз., р. Свір, Ладажскае воз. і р. Няву Б.-Б. к. злучыў Белае м. з Балтыйскім і скарацiў шлях ад Ленінграда да Архангельска на 3919 *км*. Даў магчымасць асвойваць і выкарыстоўваць суседнія раёны, багатыя лесам і буд. матэрыяламі. Уздоўж канала выраслі гарады Беламорск, Сегежа, Мядзведжагорск.

БЕЛАМО́РСКАЯ КУЛЬТУ́РА, культура неалітычных плямёнаў, якія засялялі ў 3-м пач. 1-га тысячагоддзя да н. э. Анежскі п-аў і ўсх. бераг Белага м. Характэрна масіўнымі накапечнікамі стрэл, падобнымі на ланцэт, скрэбкамі з пільчатай рэтушшу, амаль поўнай адсутнасцю сякучых прылад. Посуд кругладонны, яйцападобны. Арнамент ямчана-грабеньчаты. Гал. занятак насельніцтва — паляванне на марскіх жывёл. Стаянкі размяшчаліся на дзюнах, педалёка ад мора.

Літ.: Брюсов А. Я. Очерки по истории племен Европейской части СССР в неолитическую эпоху, М., 1952.

БЕЛАПО́ЛЬСКІ Арыстарх Апалонавіч [1(13).7.1854, Масква — 16.5.1934], рускі астраном. Акад. Пецярбургскай АН (1903). Працаваў у Маскоўскай і Пулкаўскай абсерваторыях. Асн. навук. працы ў галіне астрафізікі і астраметрыі. З дапамогай спектрографаў уласнай канструкцыі вывучаў спектры Сонца, пераменных зорак, вызначаў і даследаваў прамянёвыя скорасці яркіх зорак. Даказаў (1894) метэарытную будову кольцаў Сатурна. Упершыню (1900) у лабараторных умовах праверыў *Доплера з'яву* ў дачыненні да святла.

Тв.: Астрономические труды. Научно-биогр. очерк и комментарии О. А. Мельникова, М., 1954.

Літ.: Еремеева А. И. Выдающиеся астрономы мира. Рекомендательный указатель, М., 1966, с. 279—286.

БЕЛА́ПШ, гл. *Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў і паэтаў.*

«БЕЛАРУС» («Bielarus»), штотыднёвая грамадска-палітычная і літаратурная газета. Выдавалася з 13.1.1913 да 30.7.1915 у Вільні на бел. мове, друкавалася лацінкай. Мела рэліг. накіраванасць, разлічана была на бел. сялян-католікаў. Змяшчала артыкулы пра с. гасп. і эканоміку Беларусі, літ. матэрыялы (вершы, апавяданні, публіцыстыку). У газ. друкаваліся А. Гарун, А. Зязюля, А. Паўловіч і інш. бел. пісьменнікі. Рэдактары-выдаўцы: А. І. Бычкоўскі, з № 5 за 1914 Б. А. Пачопка.

БЕЛАРУС Пётра (сапр. Пётр Яленскі; г. н. і см. невяд.), беларускі пісьменнік. У 1913—15 друкаваўся ў «Нашай ніве». Аўтар вершаў («Мой мілы край, край родны Беларусь!..»), апавяд. («У кузні»), публіцыст. арт. («Колькі слоў аб Беларусі і беларускай песні»). Апавяд. «Якім Бяздольны» выйшла асобным выданнем (Вільня, 1914). Прапагандаваў нар. мастацтва, выступаў супраць непісьменнасці і бескультур'я дарэвалюц. вёскі. Творы Б. асветніцкага характару, аднак нярэдка ў іх гучаць матывы асуджэння сац. парадкаў тагачаснага грамадства.

Тв.: У зб.: Беларуская дакастрычніцкая проза, Мн., 1965. *Л. С. Голубева.* Мінск.

БЕЛАРУСКА-ВАЛДАЙСКАЯ ПРАВІНЦЫЯ, састаўная частка ландшафтнай падзоны мяшаных лясоў Усходне-Еўрапейскай раўніны. Займае паўн. частку БССР да паўд. ускраін Ашмянскага, Мінскага і Аршанскага ўзвышшаў. Характэрна чаргаванне ўзгорыста-марэннага рэльефу, флювіягляцыяльных і азёрна-ледавіковых раўнін. Клімат халаднаваты, вільготны. Сярэдняя т-ра ліп. 17,0—17,5, студз. ад −6,0 да −8,0 °С. Ападкаў 600—700 *мм* за год. Вегет. перыяд 170—190 дзён. Найбольш значная рака Зах. Дзвіна. Шмат азёраў ледавік. паходжання. Самыя вялікія Нарач, Асвейскае, Дрысвяты, Лукомльскае. Балоты пераважна нізінныя. У паўночнай і інш. раёнамі БССР многа вярховых балотаў. Дзярнова-падзолістыя сугліністыя завалуненыя глебы ўзвышшаў зменьваюцца пясчана-супескавымі, часцей аглеенымі ў нізінах. На Полацкай нізіне частыя цяжкасугліністыя і сугліністыя дзярнова-падзолістыя глебы на азёрна-ледавіковых адкладах. Пад с.-г. ўгоддзямі 50% тэр. (пад ворывам 35%), лясістасць 25%. Шыракаліста-яловыя лясы чаргуюцца з паўднёватаежнымі. Асн. культуры: азімае жыта, кармавыя, лён, бульба.

БЕЛАРУСКАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ ПРАЛЕТА́РСКА-КАЛГА́СНЫХ ПІСЬМЕ́ННІКАЎ (БелАПКП), утворана 25.4.1931. Чл.: М. Багун, С. Баранавых, П. Броўка, Ц. Гартны, П. Глебка, С. Дарожны, А. Дудар, А. Жаўрук, М. Зарэцкі, В. Каваль, Т. Кляшторны, А. Куляшоў, Я. Купала, С. Ліхадзіеўскі, М. Лужанін, М. Лынькоў, Я. Скрыган, У. Хадыка, М. Чарот, К. Чорны і інш. Мела аддзяленне ў Мінску, філіі ў Клімавічах, Чэрвені, Полацку. Ставіла мэту выхоўваць новых пісьменнікаў з сялянскага асяроддзя, памагчы ім авалодаць марксісцка-ленінскім светапоглядам, паўней і яскравей адлюстроўваць буд-ва сацыялізм. гаспадаркі і класавую барацьбу ў вёсцы, напісаць гісторыю калгасаў, саўгасаў і МТС. Члены БелАПКП выязджалі ў калгасы і саўгасы, арганізоўвалі літ. гуркі ў раёнах (Клімавіцкім, Талачынскім, Чэрвеньскім, Смалявіцкім, Заслаўскім, Касцюковіцкім, Пухавіцкім, Клічаўскім і Смілавіцкім). Выдавала час. *«Беларусь калгасная»*. Спыніла дзейнасць у чэрв. 1932 у сувязі з арг-цыяй Аргкамітэта СП БССР.

І. У. Саламевіч. Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ВО́ЛЬНАЕ ЭКАНАМІ́ЧНАЕ ТАВАРЫ́СТВА, створана 2.12.1826 у Віцебску буйнымі памешчыкамі Віцебскай і Магілёўскай губ. з мэтай павышаць прадукцыйнасць прыгоннiцкай працы ва ўмовах развіцця капіталіст. адносін. Апрача памешчыкаў бел. губерняў у яго ўваходзіла некалькі чл. *Вольнага эканамічнага таварыства* ў Пецярбурзе разам з вядомым рус. эканамістам М. С. Марцінавым. Прэзідэнтам т-ва лічыўся ген.-губернатар Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губ. М. М. Хаванскі. У 1827 т-ва пабудавала каля Віцебска маёнтак Залучоссе, каб арганізаваць там узорную гаспадарку і земляробчую школу. Але спроба гэтая не ўдалася, бо без карэннай змены вытворчых адносін нельга было дамагчыся развіцця прадукцыйных сіл. Імкнулася абагульняць дасягненні с.-г. навукі ў Расіі і за мяжой і выкарыстоўваць іх ва ўмовах Беларусі. Пра гэта сведчаць паспяховыя доследы араць зямлю, не пераварочваючы пласта. Т-ва выдала адзін нумар час. «Летопись Белорусского общества сельского хозяйства» (СПб., 1841), у якім змешчаны яго статут, артыкулы пра вынаходства новага плуга, арашэнне лугоў, разрыхленне падзёму, лячэнне і засцярогу жывёлы ад паморку, пра віпакурства на Беларусі і інш. Спыніла дзейнасць у вер. 1841.

Літ.: Воробей Н. В. О белорусском вольном экономическом обществе (Из истории экономической мысли в Белоруссии в первой половине XIX в.), у кн.: Сборник научных работ Белорусского политехнического института, в. 68, Мн., 1958; Труды первого областного съезда сельских хозяев в гор. Двинске в 1903 г., Витебск, 1904.

М. В. Верабей. Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАВЕ́ЦКАЕ ТАВАРЫ́СТВА ў Вільні, суполка, якая выпускала і прадавала беларускія кнігі і календары. Засн. 1.7.1913. Арганізатары Б. Даніловіч, К. Шпакоўскі і інш. 2.8.1913 адкупіла ў «Нашай нівы» бел. кнігі і календары папярэдніх гадоў выдання. Спачатку наз. «Бел. выдавецкая суполка», потым «Бел. выдавецкае т-ва ў Вільні». У 1914 выпусціла ў друкарні М. Кухты 13 кніг (агульны тыраж 42 тыс. экз.), у т. л. «Родныя з'явы» Т. Гушчы (Я. Коласа), «Рунь» М. Гарэцкага, «Васількі» Ядвігіна Ш., «Курганную кветку» К. Буйло, «Сігнал» У. Гаршына і інш. Выдала «Беларускія календары» на 1914, 1915 і 1916. Адзінае бел. выдавецтва, якое да рэвалюцыі пляцiла ганарар. У 1-ю сусв. вайну спыніла дзейнасць (у 1915 выйшла 2 кнігі). Аднавіла выдавецкую справу ў 1919. Выпускала навук.-папулярную, навучальную і мастацкую л-ру, календары. Найбольш інтэнсіўна працавала ў 1926—28, калі знаходзілася пад уплывам Бел. сялянска-рабочай грамады. У гэты перыяд выдала «Выбраныя творы» Я. Коласа, «Дэман» М. Лермантава, «Судны дзень» У. Караленкі, альманах заходнебел. паэзіі «Рунь веснаходу», брашуры «Пазашкольная асвета» і «Аб арганізацыі беларускай працоўнай школы» С. Паўловіча і інш. Пасля разгрому Грамады і пасольскага клуба «Змаганне» кіраўнічую ролю ў т-ве захапілі правыя згодніцкія элементы, і яно неўзабаве заняпала. У пач. 30-х г. пашыральнікам прагрэс. л-ры ў Зах. Беларусі стала выдавецкае т-ва «Рунь» з цэнтрам у Беластоку.

Літ.: Александровіч С. Пуцявіны роднага слова, у яго кн.: Гісторыя і сучаснасць, Мн., 1968.

С. Х. Александровіч. Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСКА-КУЛЬТУ́РНАЕ ТАВАРЫ́СТВА (БГКТ), грамадская арганізацыя, якая вядзе культурна-асветную работу сярод беларускага насельніцтва ў Польшчы. Засн. ў 1956. Гал. праўленне ў Беластоку, гарадскія і павятовыя аддзелы — у Беластоку, Варшаве, Бельску, Гайнаўцы, Дуброве, Саколцы, Сямяцічах, Гданьску. З удзелам БГКТ адкрыты кафедра бел. філалогіі ў Варшаўскім ун-це (заг. праф. А. *Абрамбская-Яблонская*) і аддзяленне бел. філалогіі пры завочнай настаўніцкай студыі ў Беластоку. Яны рыхтуюць кадры для бел. пачатковых і сямігадовых школ на Беласточчыне. З 1958 пры БГКТ працуе бел. літ. аб'яднанне «Белавежа», чл. яго выдалі зб. «Рупь» (1959), «Мой родны кут» (1963), «Белавежа» (1965). У Беластоку выйшлі таксама кніжкі вершаў бел. паэтаў у Польшчы А. Баршчэўскага (псеўд. А. Барскі), Я. Анісаровіча (псеўд. Я. Буш), В. Шведа. З 1959 працуе навук. гурток, які ў 1960 і 1964 выдаў зборнікі сваіх прац. БГКТ стварыла бел. этнагр. музей у Белавежы, ансамбль песні і танца «Лявоніха», аб'яднанне бел. мастакоў; з 1956 выпускае штотыднёвую газ. «Ніва» і штогоднік «Беларускі каляндар».

А. І. Мальдзіс. Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ДАБРАДЗЕ́ЙНАЕ ТАВАРЫ́СТВА (БДТ), грамадская арганізацыя ў Зах. Беларусі, якая займалася аказаннем дапамогі і ўтрыманнем інтэрнатаў пры беларускіх гімназіях, настаўніцкіх семінарыях і інш. Знаходзілася ў Вільні. У 1925—30 была пад уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычных і нацыянальна-вызваленчых арганізацый *Беларуская сялянска-рабочая грамада* і *«Змаганне»*, атрымлівала субсідыі ад Чырв. крыжа БССР. У пач. 30-х г. пасля разгрому «Змагання» трапіла пад уплыў бел. бурж. нацыяналістаў.

БЕЛАРУСКАЕ ДОБРААХВО́ТНАЕ ТАВАРЫ́СТВА АХО́ВЫ ПО́МНІКАЎ гісторыі, і культуры, грамадская арганізацыя, створаная паводле пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР. Устаноўчы з'езд (снеж. 1966) прыняў Статут і выбраў Цэнтр. савет т-ва. Працуюць (1970) 6 абл., 122 раённыя, 18 гарадскіх і 5096 пярвічных арг-цый, яны аб'ядноўваюць 548 647 індывідуальных і 4513 калектыўных членаў. Т-ва мае секцыі: гісторыі і археалогіі; архітэктуры, выяўленчага і нар. мастацтва; маладзёжную. Ахоўвае гістар. і археал. помнікі; месцы і збудаванні, звязаныя з найбольш важнымі падзеямі ў жыцці бел. народа і народаў СССР, а таксама выдатнымі асобамі; помнікі архітэктуры (крэпасці, палацы, замкі, вежы); помнікі гісторыі тэхнікі і ваен. справы, мастацтва і пісьменнасці; этнагр. помнікі. Выдае бюлетэнь «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (з крас. 1970), а таксама брашуры, буклеты, праспекты. Гл. таксама *Ахова помнікаў*.

Ф. В. Барысевіч. Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ЛІТАРАТУ́РНАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ ЧЫРВО́НАЙ А́РМІІ І ФЛО́ТУ (БелЛАЧАФ), заснавана 3.10.1930. Чл.: А. Александровіч, П. Галавач, А. Звонак, В. Каваль, Я. Колас, Я. Купала, М. Лынькоў, В. Сташэўскі, М. Чарот і інш. Мела на мэце

садзейнічаць творчаму росту новых літ. сіл з радоў арміі, стварэнню маст. твораў на ваенна-абаронную тэматыку. У вайсковых часцях арганізоўвала літ. гурткі, наладжвала літ. вечары. Выдала альманах «БелЛАЧАФ» (1931), у ім змешчаны творы І. Барашкі, Я. Бобрыка, П. Броўкі, А. Вольнага, П. Галавача, С. Ліхадзіеўскага, В. Сташэўскага, М. Чарота, С. Шушкевіча і інш. Спыніла дзейнасць пасля арг-цыі Аргкамітэта ССПБ (чэрв. 1932), пры якім была створана камісія абароннай маст. л-ры, а пазней ваенна-абаронны літ.-маст. час. *«Напагатове»*.

БЕЛАРУСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АБ'ЯДНАННЕ (БНА), бурж.-нацыяналіст. клерыкальная партыя ў Зах. Беларусі ў 1936—40. Пасля наз. *Беларуская хрысціянская дэмакратыя* (БХД).

БЕЛАРУСКАЕ ПАЛЕ́Р'Е, фізіка-геаграфічная акруга, састаўная частка Беларуска-Валдайскай правінцыі. У адм. адносінах сюды ўваходзяць Віцебская вобл., паўн. часткі Мінскай і Гродзенскай абласцей. Фізіка-геаграфічныя раёны (паводле В. А. Дзяменцьева): *Нешчардайскае ўзвышша, Суражская нізіна, Свянцянскія грады, Ушацка-Лепельскае ўзвышша, Полацкая нізіна, Чашніцкая раўніна, Невельска-Гарадоцкае ўзвышша, Віцебскае ўзвышша, нізіна Лучосы, Нарачана-Вілейская нізіна, Верхнебярэзінская нізіна.*

Б. П. вылучаецца разнастайным і маладым ледавіковым рэльефам. Буйнаўзгорыстыя марэнныя ўзвышшы з глыбокімі катлавінамі азёраў чаргуюцца са спадзістахвалістымі марэннымі і плоскаўвагнутымі азёрна-ледавіковымі раўнінамі. Шырока развіты комплекс ледавіковых формаў рэльефу: вобласць ледавіковага языка з лагчынамі і разнастайнымі азёрамі, озамі, камамі, друмлінамі, вобласць краявой марэны з градападобным узгорыстым рэльефам, водналедавіковыя і азёрна-ледавіковыя нізіны. Б. П. размешчана на мяжы вялікіх тэктанічных структур: паўн. схілу Беларускага крышталічнага масіву ў цэнтры, Аршанскай упадзіны на ПнУ і Латвійскай седлавіны на Пн і ПнЗ. На крышталічным фундаменце залягаюць асадкавыя пароды пратэразойскага і палеазойскага (ардовікскага, сілурыйскага і дэвонскага) узростаў. Яны перакрываюцца вялікай (больш за 150 *м*) тоўшчай антрапагенавых адкладаў бярэзінскай, дняпроўскай і валдайскай ледавіковых эпох. Паўд. мяжа Б. П. праходзіць па лініі Вільнюс — Маладзечна — Докшыцы — Лепель — Орша. Б. П. ўключае канечнамарэнныя грады свянцянскай і браслаўскай фаз (стадый) *валдайскага абледзянення* і водналедавіковыя раўніны часу яго адступання. Карысныя выкапні: цагельна-чарапічныя гліны, баластавыя буд. пяскі, жвір, даламіт і торф. Клімат халаднаваты, вільготны, больш суровы, чым на астатняй тэр. БССР. Сярэдняя т-ра ліп. 17—18, студз. да —8 °С. Вегет. перыяд 178—190 дзён. Ападкаў 550—600 *мм* за год. Тоўшча снегавога покрыва 25—35 *см*. Найбольшая рака Б. П.— Зах. Дзвіна (даўж. 1020 *км*) з прытокамі: Обаль, Дрыса (правыя), Лучоса, Ула, Ушача, Дзісна (левыя). На З Вілія, на Пд Бярэзіна, на ПнУ пачынаецца р. Ловаць. Каля 3000 азёраў. Самыя вял. Нарач, Асвейскае, Дрысвяты. На Свянцянскіх і Браслаўскай градах, Лукомльскім, Віцебскім, Гарадоцкім узв. пераважаюць дзярнова-падзолістыя сугліністыя валунныя, часта са змытым верхам глебы. На нізінах — дзярнова-падзолістыя супясчаныя і пясчаныя, месцамі на Полацкай нізіне дзярнова-падзолістыя залішне ўвільготненыя і глеяватыя цяжкасугліністыя. Дзярнова-балотныя і тарфяныя глебы асобнымі ўчасткамі, пайбольш у стараж. азёрных катлавінах, міжградавых паніжэннях і далінах рэк. Алювіяльна-лугавыя глебы ў далінах Бярэзіны, Вілії і інш. рэк. Каля 30% тэрыторыі выкарыстоўваецца пад ворыва, каля 31% — пад лесам, які адносіцца да падзоны дубова-яловых лясоў; пераважаюць хваёвыя фармацыі. Найбольш аблесены пясчаныя нізіны, дзе растуць хваёвыя, часта забалочаныя лясы. На больш высокіх узгорыстых участках або ў невялікіх забалочаных паніжэннях акрамя хвоі і елкі сустракаюцца драбналістыя пароды, радзей дуб, клён і ліпа. Балотаў каля 8%, з іх $^2/_3$ вярховых. У фаўне Б. П. побач з насельнікамі еўрап. шыракалістых лясоў ёсць віды жывёл, уласцівыя таежнай зоне: рысі, вавёркі-ляцяці і асабліва птушкі (арэхаўка, крыжадзюбелавік, белая курапатка і інш.).




Возера Цёста.

Літ.: Дзяменцьеў В. А., Шкляр А. Х і Якушка В. П. Прырода Беларусі, Мн., 1959; Физико-географическое районирование СССР, М., 1968, с. 71—72.

В. П. Якушка.

БЕЛАРУСКАЕ ПАЛЕ́ССЕ, фізіка-геаграфічная правінцыя, састаўная частка Палескай нізіны паміж Бугам і Дняпром. Займае амаль усю Брэсцкую, б. ч. Гомельскай, Пд Мінскай і нязначныя часткі Гродзенскай і Магілёўскай абл. На Пн пераходзіць ва ўзгорыста-раўнінную цэнтр. частку Беларусі, на Пд ва Украінскае Палессе. Працягласць Б. П. з З на У больш за 500 *км*, з Пн на Пд каля 200 *км*; пл. больш за 60 тыс. *км*^{2}. Паводле В. А. Дзяменцьева ў склад Б. П. ўваходзяць наступныя фіз.-геагр. раёны: *Брэсцкае Палессе, Загародзе, Прыпяцкае Палессе, Мазырскае Палессе,*



Краявід Палесся.

Гомельскае Палессе (частка Прыдняпроўскай нізіны).

Рэльеф. Найбольш паніжаная частка Б. П. складзена з сістэмы плоскіх водналедавіковых раўнін і рачных тэрас са слабым нахілам на ПдУ (на нязначным участку ў бас. Бута на З). Паверхня нізіны мае пераважныя абс. адзнакі 100—150 *м*. Сустракаюцца асобныя ўзвышшы і грады: *Мазырская града* (206 *м*), Лагішынскае і *Хойніцка-Брагінскае ўзвышша.* Цэнтр. частку Б. П. займае шырокая даліна р. Прыпяці з дзвюма надпоймавымі тэрасамі. Найб. паніжаная ч. нізіны (100—130 *м* над узр. м.) з амаль плоскім рэльефам занята балотамі і забалочанымі



Дзюны каля Калінкавіч.

ўчасткамі з пясчанымі дзюнамі, узгоркамі і старажытнымі берагавымі валамі р. Прыпяці, якія перапрацаваны эолавымі працэсамі. Асн. формы рэльефу (участкі водналедавіковых і азёрных раўнін) утварыліся ў выніку дзейнасці дняпроўскага і маскоўскага ледавікоў і асабліва расталых водаў (выцякалі з-пад іх пярэдняга краю) і водаў валдайскага ледавіка (паступалі па далінах рэк Шчары, Дняпра, Бярэзіны). Вял. ролю ў фарміраванні сучаснага рэльефу адыгралі акумулятыўная дзейнасць Прыпяці (шырокія надпоймавыя тэрасы) і працэсы забалочвання нізінных участкаў у галацэне.

Геалагічная будова і карысныя выкапні. У геал. адносінах тэр. Б. П. ахоплівае некалькі вялікіх тэктанічных структур: *Прыпяцкую ўпадзіну, Брэсцкую ўпадзіну* і Палескую седлавіну.

Крышталічны фундамент разбіты разрыўнымі тэктанічнымі парушэннямі на асобныя блокі, апушчаны на глыб. 1,5—5,5 *км* ва ўпадзінах і прыўзняты на 110 *м* вышэй узр. м. ў межах Палескай седлавіны (Мікашэвічы). Брэсцкая і Прыпяцкая упадзіны запоўнены магутнай тоўшчай пратэразойскіх, палеазойскіх адкладаў, перакрытых мезазойскімі і кайназойскімі. Антрапагенавыя адклады (водналедавіковыя, старажытныя і сучасныя алювіяльныя і азёрныя супескі і пяскі, радзей марэнныя і лёсападобныя суглінкі) суцэльным покрывам заляг аюць на падмыснодніх карэнных пародах. Толькі ў паўд. частцы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. (в. Глушкавічы) выходзяць на паверхню пароды крышталічнага фундамента. Складаная тэктанічная будова Б. П., развіццё карставых з'яў, наяўнасць стараж. прамывін у мелавых адкладах, а таксама нявытрыманасць на плошчы водатрывалых тоўшчаў антрапагену ствараюць спрыяльныя ўмовы для гідраўлічнай сувязі глыбінных ваданосных гарызонтаў з паверхневымі і для забалочвання тэрыторыі. Базісамі сцёку служаць далiны старажытных рэк, а таксама Прыпяці і яе прытокаў. У выніку падтоку падземных водаў больш глыбокіх гарызонтаў адбываецца ўзбагачэнне глебавых водаў, глебаў і раслін многімі хім. элементамі (пераважна $CaCO_3$). Уздоўж тэктанічных парушэнняў назіраюцца выйсці высокамінералізаваных водаў на паверхню (Глуск і інш.).

Карысныя выкапні Б. П.: калійная і кам. соль *(Давыдайскае радовішча каменнай солі, Старобінскае радовішча калійнай і каменнай солі, Мазырскае радовішча каменнай солі, Петрыкаўскае радовішча калійнай солі)*; нафта *(Асташкавіцкае радовішча нафты, Рэчыцкае радовішча нафты* і інш.). На вял. балотных абшарах пашыраны паклады торфу. У кам.-вуг. і юрскіх адкладах Прыпяцкай упадзіны і ў неагенавых Брэсцкай выяўлены паклады каменнага (каля воз. Чырвонае) і бурага (каля Кобрына, на З ад Салігорска, каля в. Мілашавічы Лельчыцкага р-на) вугалю. Ёсць гаручыя сланцы каля Турава і Любані. Разведаны паклады кааліну (каля Мікашэвічаў і Людзяневічаў), шкловых і фармовачных пяскоў (Леніна, Лоеўскае і інш.), бентанітавых і вогнетрывалых глінаў (у Столінскім р-не), буд. каменю (Мікашэвічы, Жыткавічы, Сінкевічы, Глушкавічы). Нярэдкія радовішчы балотных жалезных рудаў, вохры, вівіяніту, тарфатуфаў. На ўсёй тэр. шырока выкарыстоўваюцца цагельныя гліны і суглінкі, сілікатныя і буд. пяскі, жвір, мінер. фарбы, з адорвеняў — мел і цэментныя гліны. Ёсць высокаміналізаваныя тэрмальныя воды (Ельск, Глуск і інш.), якія маюць лекавую каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца як сыравіна ў хім. прамысловасці.

Клімат і гідраграфія. Клімат Б. П. ўмерана цёплы, адрозніваецца ад астатняй тэр. БССР больш высокімі (на 1—2 °С) т-рамі лета і зімы. Сярэдняя т-ра ліп. 18—19,5 (макс. 38 °С), студз. ад —4 на З да —6,4 °С на У (мінім. —36 °С). Вегет. перыяд 195—200 дзён. Ападкаў 500—650 *мм* за год.

Найб. рака Прыпяць з прытокамі: правыя — Стыр, Гарынь, Сцвіга, Убарць, Славечна і Жалонь; левыя — Піна, Ясельда, Бобрык, Цна, Лань, Случ, Пціч і інш. Малыя ўхілы рэчышчаў і іх шырокія поймы ствараюць спрыяльныя ўмовы для акумуляцыі рачной вады ў перыяд разводдзя і летніх ліўневых паводак. Прытокі Прыпяці маюць больш вялікі ўхіл і больш хуткае цячэнне, што выклікае разліў Прыпяці на прылеглыя нізіны. Рачную сістэму дапаўняе густая сетка дрэнажных каналаў. Найб. азёры: Чырвонае, Выганаўскае, Чорнае, Бабровіцкае, Спораўскае і інш.; *Любанскае вадасховішча* на р. Арэсе і *Старобінскае вадасховішча* на р. Случы.

Глебы, расліннасць і жывёльны свет. Глебы Б. П. разнастайныя. Дзярновыя (0,5%) на пылавата-сугліністых мергелістых пародах,

пашыраны невял. масівамі ў даліне сярэдняга цячэння Прыпяці (аколіцы Турава) і ў пойме рэк Гарыні і Сцвігі. Дзярнова-падзолістыя (32,4%) на марэнных і лёсападобных суглінках, супесках і пераважна на пясках з параўнальна глыбокім узроўнем грунтавых водаў («сухія пяскі»). Дзярнова-падзолістыя забалочаныя (глеяватыя і глеевыя — 23,6%) пашыраны на пясках 1—2-й надпоймавых тэрас («мокрыя пяскі»). Дзярнова-балотныя (11,8%) у паніжэннях з блізкім узроўнем глебава-грунтавых водаў. Балотныя (22,9%) пераважна на нізінных, менш на пераходных і вярховых балотах. У поймах алювіяльныя дзярнова-глеевыя (3,8%) і тарфяна-балотныя (5,0%). Прыродны тып расліннасці на б. ч. тэрыторыі Б. П. дрэвавы і травяністы. Лясы займаюць 35,7% агульнай плошчы. Хвойна-шыракалістых лясоў 23,1% (у т. л. 19,6% хваёвыя бары і 2,2% хваёва-дубовыя лясы), найчасцей займаюць водападзельныя прасторы і надпоймавыя тэрасы. На левабярэжжы Прыпяці невялікія масівы яловых і ялова-шыракалістых лясоў. Спадзістыя схілы ўзвышшаў і роўныя тэрыторыі надпоймавых тэрас заняты шыракалістымі лясамі (5,2%), пераважна дубровамі, якія пераходзяць на ўвільготненых участках у дубова-грабовыя і грабова-ясенева-альховыя групоўкі. На высеках і пажарышчах бярозавыя і асінавыя лясы (7,4%). Поймавыя лясы — рэдкастойныя дубовыя і альховыя групоўкі. Пад лугамі 10,3% агульнай пл.: сухадольных 2,5%, нізінных 4,4, заліўных 3,4%. Балоты займаюць 26,4%, верхавыя землі 21,1, пяскі дзюнныя 1,9, воды і інш. 4,6%. У асобных мясцінах (воз. Смержаў, наваколле воз. Чырвонае) асталіся прадстаўнікі трацічнай флоры: *вадзяны арэх*, вадзяная папараць, альдраванда, *азалея*. Пераважае жывёльны свет падзоны мяшаных лясоў. Трапляюцца прадстаўнікі лесастэпавай і стэпавай зон. З млекакормячых характэрныя лось, ліс, воўк, заяц-русак, выдра, вавёрка, барсук і інш., радзей норка, казуля, дзік. Акліматызаваны янотападобны сабака, андатра. Прамысл. звяры: ліс, куніца, вавёрка, гарнастай; птушкі — цецярук, рабчык. Водзіцца балотная чарапаха. У рэках, азёрах і вадасховішчах розныя віды рыб, пераважаюць карпавыя.

Даследаванні. Некат. звесткі пра прыроду Палесся, яго водныя шляхі, насельніцтва, раслінасць апублікаваны ў 17—18 ст. У 19 ст. ў вывучэнні краю ўдзельнічалі вядомыя рус. вучоныя А. П. Карпінскі, А. Э. Гедройц, В. В. Дакучаеў, А. І. Ваейкаў, Г. І. Танфільеў, П. А. Тутковскі і інш. Заходняя экспедыцыя 1873—78 пад кіраўніцтвам І. І. *Жылінскага* па асушэнні балотаў сабрала матэрыялы пра рэльеф, клімат, раслінасць, геал. будову Палескай нізіны. У 1919—41 ва ўсіх усх. раёнах праведзены геолагаздымачныя работы, геал., геафіз., геабат., глебавыя даследаванні. Зах. Палессе вывучалі польскія даследчыкі. Пасля ўз'яднання зах. абласцей з БССР (1939) Палессе вывучаецца па адзіным плане і методыцы. Вялікія работы па вывучэнні геал. будовы, па геафізіцы, геахіміі, геал. і гідрагеал. адымках, нафтагазаноснасці, салянаснасці, пошуках і разведцы гаручых сланцаў, мінер. і пітных водаў, буд. матэрыялаў праведзены Упраўленнем геалогіі пры Савеце Міністраў БССР, Бел. геолагаразведачным НДІ, БДУ імя Леніна. Асабліва значнае надаецца меліярацыі балотаў і забалочаных зямель Палескай нізіны. Тэр. Палесся даследавалі і даследуюць таксама вучоныя АН БССР, НДІ водных праблем, Бел. тэхнал. ін-та імя Кірава, Бел. НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі, АН УССР, Белдзіправадгаса. Складзены геабатанічныя і культурагэхнічная карты, вывучаюцца гідралогія і водныя рэсурсы Палесся, меліярац. фонд зямель, вызначаны месцы магчымага буд-ва вадасховішчаў, рыбных гаспадарак. Выяўлены мат.-тэхн. і працоўныя рэсурсы Палескай нізіны, распрацаваны гідрагеалагічныя і воднагасп. нарматывы і методыкі іх разліку, метады і спосабы праектавання асушальных сістэм, схема комплекснага выкарыстання водна-зямельных рэсурсаў Палескай нізіны на 4,8 млн. *га* (у межах БССР і УССР). Супрацоўнікі БДУ імя Леніна правялі работы па вывучэнні глебаў, азёраў, фіз.-геагр. раніраванні, этнаграфіі, с. гасп., прамысловасці Палесся. Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі склаў глебавыя карты і зрабіў даследаванні аграхімічных уласцівасцей глебаў, распрацаваў рэкамендацыі па больш рацыянальным выкарыстанні балотаў і забалочаных зямель, лугоў. Выяўлены плошчы эрадзіраваных зямель і распрацаваны супрацьэразійныя мерапрыемствы.

Меліярацыя. Заходняй экспедыцыяй пракладзены лесасплаўныя каналы з рэдкай сеткай асушальных каналаў даўж. 4460 *км* (з іх каля 300 *км* на сялянскіх землях), адрэгуляваны і расчышчаны 135 рэк. Да 1913 на Палессі асушана для інтэнсіўнага с.-г. выкарыстання каля 2 тыс. *га*. Да пач. Вял. Айч. вайны ў Б. П. асушана 85 тыс. *га*, на пач. 1969 — 780 тыс. *га* балотаў і забалочаных зямель, у т. л. пад с.-г. ўгоддзямі 600 тыс. *га*. Праектны ін-т Белдзіправадгас у 1968 удакладніў меліярац. частку схемы Палескай нізіны, паводле якой у Б. П. намечана да 1985 асвоіць 2,2 млн. *га* асушаных балот і забалочаных зямель, стварыць 19 рыбгасаў, 17 вадасховішчаў і больш як 400 дробных вадаёмаў. Для гэтага ў 1966 у Пінску створана Гал. ўпраўленне пры Мін-ве меліярацыі і воднай гасп. СССР па асушэнні зямель і буд-ве саўгасаў на Палессі (*Галоўпалессеводбуд*).

Гістарычная даведка. Б. П. заселена чалавекам з часоў позняга *палеаліту* і *мезаліту*. У бронзавы век жылі плямёны палескай групы *шнуравой керамікі культуры, сосніцкай культуры, тшынецкай культуры*, часткова *лужыцкай культуры*; у жалезны век — плямёны *зарубінецкай культуры, мілаградскай культуры*. У 2-й пал. 1-га тысячагоддзя ў бас. Зах. Буга жылі *валыняне*, на левым беразе Прыпяці *дрыгавічы*, на правым *драўляне*. З канца 10 да сярэдзіны 12 ст. большая частка Б. П. ўваходзіла ў Тураўскае і Пінскае, а таксама ў Кіеўскае (Мазыр) і Чарнігаўскае княствы; з сярэдзіны 12 ст. вах. частка Б. П. — ва Уладзіміра-Валынскім княстве; з канца 13 — пач. 14 ст. — у *Вялікім княстве Літоўскім*. У канцы 16—17 ст. Б. П. ахоплена казацка-сялянскімі паўстаннямі супраць феад.-каталіцкага прыгнёту на Украіне і Беларусі (пад кіраўніцтвам С. *Налівайкі* у 1595, *Пінскае паўстанне 1648, Мазырскае паўстанне 1649, Давыд-Гарадоцкае паўстанне 1648—50, Лоеўская бітва 1649* і інш.). У 1772—95 у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай уз'яднана з Расіяй і знаходзілася ў складзе Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губ. У 1-ю сусв. вайну вах. частка Палесся (да Пінска) акупавана кайзераўскімі войскамі. Сав. ўлада ва ўсх. частцы Б. П. устаноўлена ў кастр.— ліст. 1917; тут былі створаны Палескай і Гомельская вобл. Паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* вах. частка Б. П. далучана да бурж. Польшчы і ўвайшла ў склад *Палескага ваяводства*. Уз'яднана з БССР у выніку вызвалення чага паходу Чырв. Арміі 1939. На тэр. Б. П. былі ўтворапы Брэсцкая, Гомельская, Палеская, Пінская, часткова Бабруйская і Баранавіцкая вобл. У Вял. Айч. вайну на тэр. Б. П. дзейнічалі Брэсцкае, Баранавіцкае, Гомельскае, Палескае, Пінскае, часткова Мінскае і Магілёўскае партыз. злучэнні, а таксама Сумскае партыз. злучэнне пад камандаваннем С. А. *Каўпака*. Вызвалена Чырв. Арміяй ад ням.-фаш. акупантаў у канцы 1943 — жн. 1944. Найб. гарады: Брэст, Пінск, Мазыр, Кобрын.

Літ.: Дзямянцьеў В. А., Шкляр А. Х. і Якушка О. Ф. Природа Беларусі, Мн., 1959; Геология и петрография калийных солей Белоруссии, Мн., 1969; Геохимическая характеристика литогенеза и ландшафтов Белорусского Полесья, Мн., 1966; Современная структура и история тектонического развития Припятской впадины, Мн., 1968; Лукашев К. И. и Махнач А. С. Припятская впадина — сокровищница недр Белоруссии, Мн., 1966; Шкляр А. Х. Климат Белоруссии и сельское хозяйство, Мн., 1962; Лупинович П. С., Скоропанов С. Г. и Денисов З. Н. Преобразование природы Полесской низменности, М., 1953; Растительный покров Белоруссии, Мн., 1969.

У. У. Сцяпко (фіз.-геагр. нарыс, даследаванні), *А. Н. Каржанеўскі* (меліярацыя). Мінск; *М. І. Ермаловіч* (гістарычная даведка). Маладзечна.

«БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА», штотыднёвая газета найбольш кансерватыўнай групоўкі беларускіх бурж. нацыяналістаў. Выдавалася ў Вільні з 3.2.1926 да 9.3.1928 на бел. мове. Выйшла 74 нумары. Выступала супраць рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. Выдавец — Часовая бел. рада, з № 20 за 1926 — Бел. нац. рада. Рэдактар Т. Вернікоўскі.

БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПРЫРОДЫ, добраахвотная масавая грамадская арганізацыя па ахове прыроды, рацыянальным выкарыстанні і павелічэнні прыродных багаццяў рэспублікі. Асн. задачы: прапаганда ленінскіх ідэй, рашэнняў партыі і ўрада па пытаннях аховы прыроды; арганізацыя працоўных на актыўную работу па ахове прыроды, павелічэнне яе багаццяў; выхаванне пачуцця патрыятызму і любові да прыроды; садзеянне дзярж., грамадскім і гасп. арг-цыям у ажыццяўленні мерапрыемстваў па ахове прыродных рэсурсаў. Створана ў 1962. На 1.1.1970 мела 1485 тыс. чл. Есць статут, які прадугледжвае ўдзел т-ва ў стварэнні пастаянных і часовых выставак, выданне бюлетэняў, брашур, даведнікаў, лістовак, арганізацыю лекцый, дакладаў, кансультацый. Аснова т-ва — пярвічныя арганізацыі (не менш як 5 чл.) на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, пры домакіраўніцтвах, навуч. установах і інш.

БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА ГЛУХІХ, грамадская арганізацыя пры Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння БССР. Засн. 3.8.1931. Прымае глухіх, глуханямых, тугавухіх ва ўзросце ад 16 гадоў. Цэнтр. праўленне ў Мінску. У складзе т-ва 6 абл., 14 міжраённых, больш за 600 пярвічных арг-цый. Мае 10 навуч.-вытв. прадпрыемстваў (у Мінску, Гомелі, Віцебску, Баранавічах, Брэсце, Барысаве, Бабруйску, Магілёве, Гродне, Оршы), Палац культуры ў Мінску, клубы, чырв. куткі, б-кі; арганізоўвае гурткі чытання «з губ». На Беларусі ёсць 3 вячэрнія (пазменныя) школы для дарослых глухіх (у Мінску, Гомелі, Віцебску), 25 спец. класаў пры агульнаадук. школах, аддзяленне па навучанні глухіх пры Гомельскім маш.-буд. тэхнікуме, спец. гарадское прафесіян.-тэхн. вуч. ў Мінску. В. т. г. — член Сусв. федэрацыі глухіх. Т-вы глухіх ёсць у саюзных і аўт. рэспубліках. Усерасійскае т-ва выдае час. «Жизнь глухих».

БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА ДРУЖБЫ І КУЛЬТУРНАЙ СУВЯЗІ З ЗАРУБЕЖНЫМІ КРАІНАМІ, добраахвотная грамадская арганізацыя, якая знаёміць працоўных БССР з жыццём і культурай інш. народаў і спрыяе пашырэнню за рубяжом інфармацыі пра жыццё і культуру беларускага народа. Засн. ў крас. 1926 пад назвай Т-ва культурнай сувязі Сав. Беларусі з замежжам. Члены-заснавальнікі — пісьменнікі Я. Купала, Ц. Гартны, М. Чарот, праф. С. Я. Вальфсон і інш. дзеячы бел. культуры. У 1952—58 наз. Бел. т-ва культурнай сувязі з замежжам. У склад т-ва ўваходзяць на правах калектыўных членаў грамадскія арг-цыі, творчыя саюзы, калектывы працоўных прамысл. прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, навуч. і навук. устаноў і інш. У 1970 мела 10 рэсп. і 126 мясц. аддзяленняў т-ваў дружбы з заруб. краінамі. Падтрымлівае сувязі з 271 прагрэс. арг-цыяй у 53 краінах свету (1970). Калектыўны чл. Саюза сав. т-ваў дружбы і культурнай сувязі з заруб. краінамі. *А. К. Грэцкі.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ, грамадская арганізацыя, якая наладжвае культурныя сувязі з беларусамі, што жывуць за мяжой. Засн. 28.4.1964 у Мінску (у 1955—64 працавала Бел. секцыя камітэта «За вяртанне па Радзіму»). За 50 гадоў да Кастр. рэвалюцыі і за 20 гадоў да вызвалення Зах. Беларусі Чырв. Арміяй (вер. 1939) з роднага краю выехала ў пошуках хлеба і працы 1 млн. 837 тыс. чал. Шмат сав. грамадзян апынулася за мяжой у час Вял. Айч. вайны. Т-ва наладжвае культ. сувязі з землякамі на чужыне, пасылае ім л-ру, падручнікі, фотаздымкі і кінастужкі, памагае знайсці родных. Падтрымлівае культ. сувязі з многімі прагрэс. арг-цыямі суайчыннікаў (Федэрацыя рус. канадцаў, Сябры «Русского голоса» ў ЗША, Саюз сав. грамадзян у Бельгіі, Цэнтр. кіраўніцтва клубаў у Аргенціне і інш.). У рабоце т-ва ўдзельнічаюць многія дзеячы бел. культуры: Р. Шырма (старшыня), М. Танк, П. Пестрак, І. Гурскі і інш. Выдае газ. *«Голас Радзімы»*.

Л. П. Прокша. Мінск.

БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА СЛЯПЫХ, грамадская арганізацыя пры Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння БССР. Засн. 29.3.1928. Прымае слепых па ўзросце ад 14 гадоў. Цэнтр. праўленне ў Мінску. У складзе т-ва 6 абл. аддзелаў, 140 гарадскіх, раённых і 16 вытв. пярвічных арг-цый. Мае 16 навуч.-вытв. прадпрыемстваў (у Мінску, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве, Маладзечне, Пінску і інш.), пры якіх ёсць клубы, чырв. куткі, б-кі, філіялы агульнаадук. школ рабочай моладзі, інтэрнаты. Т-вы слепых ёсць у саюзных і аўтаномных рэспубліках, у сацыяліст. краінах. Усерасійскае т-ва слепых выдае час. «Жизнь слепых», які друкуецца пропаным выпуклым шрыфтам.

БЕЛАРУСКАЕ ТЭАТРАЛЬНАЕ АБ'ЯДНАННЕ (БТА), грамадская арганізацыя творчых работнікаў тэатр. мастацтва Беларусі. Створана ў 1946, каб садзейнічаць ідэйна-мастацкаму росту бел. тэатр. мастацтва. Больш за 1200 членаў. Мае аддзяленні ва ўсіх т-рах рэспублікі. Наладжвае абмеркаванні спектакляў, творчыя сустрэчы, вечары, тэатр. выстаўкі, лекцыі, займаецца выдавецкай справай, збірае матэрыялы з гісторыі бел. т-ра, памагае прафесійным і народным тэатрам рэспублікі. Пры БТА працуе вытворчы камбінат, ёсць дом адпачынку, Дом мастацтваў. Дзейнасцю аб'яднання кіруе прэзідыум праўлення БТА, выбраны з'ездам. Старшыня прэзідыума праўлення БТА з 1946 Л. П. Александроўская. Адбылося 4 з'езды БТА (1948, 1955, 1959, 1967).

БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІЯ ЛЕТАПІСЫ, гл. *Летапісы беларуска-літоўскія.*

БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ ПАГАДНЁННІ, заключаны ўрадамі БССР і Польшчы пасля вызвалення беларускіх і польскіх зямель ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (1944—45). У вер. 1944 у Любліне ўрадавыя дэлегацыі Сав. Беларусі і Польшчы абмеркавалі праблемы, звязаныя са зменай лініі дзярж. граніцы паміж БССР і Польшчай. 9.9.1944 падпісана Пагадненне пра эвакуацыю бел. насельніцтва з тэр. Польшчы і польскіх грамадзян з тэр. БССР. Паводле пагаднення грамадзяне бел., укр., рускай і русінскай нацыянальнасцей атрымалі магчымасць пераехаць на сталае жыхарства ў Беларусь. Палякам і яўрэям, якія мелі польскае грамадзянства да 17.9.1939 і жылі ў зах. абласцях БССР, давалася права выехаць у Польшчу. Аналагічныя пагадненні з Польшчай заключылі Укр. ССР і Літ. ССР. 25.11.1945 у Варшаве прадстаўнікі БССР і Польшчы падпісалі Дадатковы пратакол да Пагаднення ад 9.9.1944, які прадоўжыў тэрмін эвакуацыі на паўтара года. У тэкст Пагаднення ўнесены некат. змены і дадаткі, якія палегчылі абмен насельніцтвам. 21.6.1952 у Маскве прадстаўнікі СССР, УССР, БССР і Літоўскай ССР з аднаго боку і прадстаўнікі Польшчы з другога падпісалі Пагадненне пра ўзаемныя разлікі, што ўзнікаюць у сувязі з эвакуацыяй насельніцтва і дэмаркацыяй граніцы.

Кр.: Белорусская ССР в международных отношениях, Мн., 1960. *Ю. П. Броўка.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ, селекцыйны сорт сліўы. Выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы Э. П. Сюбаравай (1936) скрыжаваннем сартоў *Ачакаўская жоўтая* і Пашкевіча. Плады масай 50—55 *г*, круглаватаавальныя, з белым налётам і ярка акрэсленай баразёнкай; мякаць жоўтая, сакаўная, з мядовай духмянасцю; паспяваюць у канцы жніўня. Пладаносіць на 5—6-м годзе, а ў 8 гадоў дае да 30 *кг* пладоў з дрэва. Найлепшыя апыляльнікі: *Буйнаплодная* і *Ранняя лошыцкая.* Раяніраваны ва ўсіх зонах БССР. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Сліва.*


БЕЛАРУСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944, адна з найвялікшых стратэгічных наступальных аперацый Чырв. Арміі ў Вял. Айч. вайну, ажыццёўленая на Беларусі з 23 чэрв. да канца жн. 1944. Пачалася пры спрыяльных ваенна-паліт. умовах. Зімой і вясной 1944 Сав. Узбр. Сілы дамагліся вялікіх перамог пад Ленінградам, у Крыме і ў Правабярэжнай Украіне. 6 чэрв. ў Нармандыі (Паўн. Францыя) высадзіліся англа-амерыканскія войскі, тым самым быў адкрыты *другі фронт*. Перад Чырв. Арміяй стаяла задача разбіць цэнтр. групоўку ням.-фаш. войск — групу армій «Цэнтр», вызваліць Беларусь, выйсці да дзярж. граніцы СССР і поўнасцю ачысціць сав. тэрыторыю ад акупантаў. На пачатак Б. а. лінія фронту праходзіла на У ад Полацка (азёры Нешчарда — Лосвіда), Віцебска, Оршы, Магілёва; каля Жлобіна крута паварочвала на ПдЗ па лініі Капаткевічы — Тураў — Ратна — Ковель, утвараючы т. зв. беларускі выступ даўж. каля 1100 *км*. Ням. камандаванне хацела абавязкова ўтрымаць гэты выступ, бо ён прыкрываў гал. стратэг. напрамкі — Усходнепрускі і Варшаўска-Берлінскі, забяспечваў устойлівае становішча паўн. групы армій у Прыбалтыцы, ствараў пагрозу войскам 1-га Укр. фронту (карту гл. на ўкл.).


На тэр. Беларусі гітлераўцы стварылі моцную, глыбока эшаланіраваную (да 270 *км*) лінію абароны пад назвай «Фатэрлянд» («Бацькаўшчына»), тым самым падкрэсліваючы, што ад яе залежыць лёс Германіі. Спец. загадам Гітлера Віцебск, Орша, Магілёў, Бабруйск, Барысаў, Мінск абвяшчаліся крэпасцямі, камандуючыя якіх давалі фюрэру пісьмовыя абавязацельствы «ўтрымліваць раёны да апошняга салдата, нават пры ўмовах акружэння». Толькі асабіста Гітлер па хадайніцтве групы армій мог даць загад пакінуць гэтыя раёны. Гітлераўскае камандаванне сканцэнтравала на Беларусі моцную групоўку войск, у якую ўваходзілі група армій «Цэнтр» (ген.-фельдмаршал Буш, з 28 чэрв. ген.-фельдмаршал В. Модэль) у складзе 3-й танкавай (ген.-палк. Рэйнгарт), 4-й (ген. пяхоты К. Тыпельскірх), 9-й (ген. пяхоты Іардан, з 27 чэрв. ген. танкавых войск Форман) і 2-й (ген.-палкоўнік Вейс) паляўых армій; часткі 16-й ням. арміі з групы армій «Поўнач» і 4-й танкавай арміі з групы армій «Паўночная Украіна» — усяго 63 дывізіі (налічвалі больш за 1,2 млн. чал.). Групоўку падтрымліваў 6-ы паветр. флот.

Распрацоўка Б. а. пачалася вясной 1944. Папярэдні план аперацыі, складзены ген.

Камандуючы 1-га Беларускага фронту генерал арміі К. К. Ракасоўскі і начальнік аператыўнага Управлення фронту генерал-маёр І. І. Байкоў у штабе 1-га Беларускага фронту.







арміі А. І. *Антонавым*, які выконваў абавязкі нач. Ген. штаба, 20 мая быў прадстаўлены ў Стаўку пад кодавай назвай *«Багратіён»*. Удакладніўшы яго з камандуючымі франтоў, 31 мая Стаўка аддала дырэктывы франтам праводзіць аперацыю. План намячаў адначасова прарваць абарону ворага на 6 розных участках каля Віцебска, Оршы, Магілёва і Бабруйска і нанесці тры магутныя ўдары ў напрамках на Вільнюс, Мінск, Баранавічы. Войскі 1-га, 2-га і 3-га Бел. франтоў павінны былі акружыць і знішчыць віцебскую і бабруйскую варожыя групоўкі, потым галоўныя сілы 4-й ням. арміі на У ад Мінска і выйсці на лінію Маладзечна — Стоўбцы. Да пачатку Б. а. і нават у ходзе яе ням.-фаш. камандаванне было ўпэўнена, што Чырв. Армія галоўны ўдар нанясе на Украіне або з Пд Палесся, таму сканцэнтравала там асн. сілы (да 80% усіх танкавых дывізій). Каб увесці ў зман праціўніка і падтрымаць яго памылковую думку, сав. камандаванне дэманстравала на гэтых участках фронту канцэнтрацыю рэзерваў, стварала падманныя аэрадромы і інш. Б. а. пачалася 23.6.1944. Удар па цэнтр. групоўцы ворага на фронце ад Полацка да Мазыра працягласцю 700 *км* наносіўся сіламі 4 франтоў у складзе 14 агульнавайсковых, 1 танкавай арміі, 2 конна-механізаваных груп, 4 асобных танкавых карпусоў і 4 паветраных армій. Сав. камандаванне на гэтым участку стварыла амаль двайную перавагу над праціўнікам у жывой сіле, амаль трайную ў артылерыі (больш за 24 тыс. гармат і мінамётаў супраць 9,5 тыс.) і 4-разовую ў танках і самалётах (больш за 4 тыс. танкаў і самаходных установак супраць 900 і больш за 5300 самалётаў супраць 1300).

Войскі 1-га Прыбалт. фронту (ген. арміі І. Х. *Баграмян*) у складзе армій: 4-й ударнай (ген.-л. П. Ф. Малышаў), 6-й гвардзейскай (ген.-л. І. М. Чысцякоў), 43-й (ген.-л. А. П. Белабародаў), 3-й паветранай (ген.-палк. авіяцыі М. П. Папівін), а таксама прыдадзенага 1-га танкавага корпуса наносілі ўдар на Пн ад Віцебска. На Багушэўскім і Аршанскім напрамках наступалі войскі 3-га Бел. фронту (ген.-палк. І. Д. *Чарняхоўскі*) у складзе армій: 39-й (ген.-л. І. І. Люднікаў), 5-й (ген.-л. М. І. Крылоў), 31-й (ген.-л. В. В. Глаголеў), конна-механізаванай групы (ген.-л. М. С. Аслікоўскі), 1-й паветранай арміі (ген.-палк. авіяцыі Ц. Ц. Хрукін), а таксама прыдадзеных 11-й гвардз. арміі (ген.-л. К. М. *Галіцкі*) і 2-га гвардз. танкавага корпуса (ген.-м. А. С. *Бурдзейны*). Рэзерв Стаўкі — 5-я гвардз. танкавая армія (маршал бранятанкавых войск П. А. *Ротмістраў*). На Магілёўскім напрамку наступалі войскі 2-га Бел. фронту (ген.-палк. Г. Ф. *Захараў*) у складзе армій: 33-й (ген.-л. В. Дз. Кручонкін), 49-й (ген.-л. І. Ц. Грышын), 50-й (ген.-л. І. В. Болдзін), 4-й паветранай (ген.-палк. авіяцыі К. А. *Вяршынін*). На Пн ад Рагачова і на Пд ад Жлобіна ў напрамку на Бабруйск наносілі ўдар войскі 1-га Бел. фронту (ген. арміі К. К. *Ракасоўскі*) у складзе армій: 3-й (ген.-л. А. В. *Гарбатаў*), 48-й (ген.-л. П. Л. Раманенка), 65-й (ген.-палк. П. І. *Батаў*), конна-механізаванай групы (ген.-л. І. А. Плі-еў), 16-й паветр. арміі (ген.-палк. авіяцыі С. І. Рудзенка), 6-й паветр. арміі (ген.-л. авіяцыі Ф. П. Палынін), а таксама прыдадзеных 28-й арміі (ген.-л. А. А. Лучынскі), 9-ы і 1-ы гвардз. танкавыя карпусы, 1-ы механізаваны і 4-ы гвардз. кавалерыйскі карпусы; *Дняпроўская ваенная флатылія* (капітан 1-га рангу В. В. Грыгор'еў). У ходзе наступлення сав. войск у Б. а. прынялі ўдзел арміі: 61-я (ген.-л. П. А. Белоў), 70-я (ген.-л. В. С. Папоў), 47-я (ген.-л. М. І. Гусеў), 8-я гвардз. (ген.-л. В. І. *Чуйкоў*), 69-я (ген.-л. У. Я. Калпакчы), 2-я танкавая (ген.-палк. танкавых войск С. І. Багданаў), 1-я армія Войска Польскага (ген.-л. З. Берлінг). Дзеянні франтоў каардынавалі прадстаўнікі Стаўкі: 1-га Прыбалт. і 3-га Бел. Маршал Сав. Саюза А. М. *Васілеўскі*, 2-га і 1-га Бел. Маршал Сав. Саюза Г. К. *Жукаў*; дзеянні ВПС маршалы авіяцыі Ф. Я. Фалалееў і А. А. *Новікаў*. На 2-і Бел. фронт дадаткова быў пасланы ген. С. М. Штэменка з групай афіцэраў. Для ажыццяўлення Б. а. сав. камандаванне дадаткова накіравала 5 агульнавайсковых, 2 танкавыя і 1 паветр. арміі, Стаўка перадала са свайго рэзерву 5 асобных танкавых, 2 механізаваныя і 4 кавалерыйскія карпусы, дзесяткі асобных палкоў і брыгад усіх родаў войск, перабазіравала 11 авіяц. карпусоў. Усяго тут было сканцэнтравана 38% стралковых, 40% танкавых і механізаваных злучэнняў, 47% франтавой авіяцыі Сав. Арміі. Найб. сілы і сродкі сав. камандаванне накіравала ў распараджэнне 1-га Бел. фронту, надаючы асабліва важнае значэнне ўдару на гэтым участку.


Раніцай 23 чэрв. гал. сілы 1-га Прыбалт., 3-га і 2-га Бел. франтоў пасля моцнай артыл. і авіяц. падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках. Назаўтра пачалі наступаць войскі 1-га Бел. фронту на Бабруйскім напрамку. Ломячы ўпартае супраціўленне праціўніка, сав. войскі за 6 дзён прарвалі абарону на глыбіню 100—150 *км*. Войскі 1-га Прыбалт. фронту ва ўзаемадзеянні з войскамі 3-га Бел. фронту 25—27 чэрв. акружылі і разбілі ві-



Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі і маршал бранятанкавых войск П. А. Ротмістраў на пераправе цераз Бярэзіну.

Камандуючы 1-га Прыбалтыйскага фронту генерал арміі І. Х. Баграмян і начальнік штаба фронту генерал-лейтэнант У. В. Курасаў у час Беларускай аперацыі 1944.






Камандуючы 3-га Беларускага фронту генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі ставіць баявыя задачы камандуючым армій напярэдадні Беларускай аперацыі 1944.

цебскую групоўку гітлераўцаў у складзе 5 дывізій. 26 чэрв. быў вызвалены Віцебск, 28 чэрв. Лепель (гл. *Віцебска-Аршанская аперацыя 1944*). Тым самым ключавая пазіцыя праціўніка на левым фланзе абароны групы армій «Цэнтр», якую гітлераўцы называлі «варотамі да Прыбалтыкі», была зруйнавана. 26 чэрв. войскі 3-га Бел. фронту ліквідавалі моцны вузел абароны каля Оршы, вызвалілі Дуброўна, Сляпо, Талачын. Адначасова войскі 2-га Бел. фронту разгарнулі аперацыі на Магілёўскім напрамку. Зламаўшы моцныя абарончыя рубяжы праціўніка, яны фарсіравалі Дняпро на ўчастку 120 *км* і 28 чэрв. авалодалі Магілёвам, Шкловам, Быхавам, Клічавам. Да гэтага ўчастка былі прыкаваны гал. сілы 4-й пям. арміі, што садзейнічала потым акружэнню і поўнаму яе разгрому. Войскі 1-га Бел. фронту да 29 чэрв. акружылі і поўнасцю разгромілі бабруйскую групоўку ворага ў складзе 5 дывізій. Гл. *Бабруйская аперацыя 1944*.


Праціўнік адступаў на ўсім фронце ад Зах. Дзвіны да Прыпяці. На канец чэрв. сав. войскі выйшлі на лінію Полацк — Барысаў — р. Друць — Асіповічы — Глуск. Каб выратаваць ад поўнага разгрому 4-ю армію і рэшткі 3-й танкавай і 9-й армій, над якімі навісла пагроза акружэння, фаш. камандаванне рабіла адчайныя спробы аднавіць абарону па лініі Полацк — р. Вярэзіна — р. Арэса па У ад Слуцка. Дзеля гэтага на Беларусь перакідваліся дывізіі з Германіі і акупаваных краін, хоць у Нармандыі разгортваліся баі супраць англа-амер. войск. Камандуючага ням.-фаш. войск на Беларусі фельдмаршала Буша Гітлер замяніў фельдмаршалам Модэлем. Але нішто не магло спыніць пераможнага наступлення Сав. Арміі.

Войскі 3-га Бел. фронту 30 чэрв. фарсіравалі Вярэзіну і разбілі барысаўскую групоўку ворага, досвіткам 1 ліп. вызвалілі Барысаў — важны апорны пункт ням. абароны, які прыкрываў подступы да Мінска. Гітлераўскае камандаванне, каб не дапусціць акружэння 4-й арміі, сцягнула ў раён Мінска рэшткі 78-й штурмавой, 250-й, 260-й пяхотных і 5-й штурмавой танкавай дывізій, а таксама перакінутыя з Польшчы 24-ы, 25-ы і 26-ы паліцэйскія палкі СС і розныя спец. падраздзяленні. 2 ліп. вечарам 3-га Бел. фронту абышлі Мінск з ПнЗ, авалодалі Вілейкай, Красным, перахапілі чыгунку Мінск — Вільнюс. Войскі 1-га Бел. фронту, якія наступалі на Пд ад Мінска, 30 чэрв. вызвалілі Слуцк, 2 ліп. Стоўбцы, Гарадзею, Нясвіж, перарэзалі чыгунку Мінск — Баранавічы і закрылі праціўніку адыход на ПдЗ. На досвітку 3 ліп. 2-і гвардз. танкавы корпус уварваўся ў Мінск з У. У сярэдзіне дня з Пд у горад увайшоў 1-ы гвардз. танкавы корпус М. Ф. Панова, а з Пн — часці 5-й гвардз. танкавай, 11-й гвардз. і 33-й армій. Услед за танкавымі ў Мінск увайшлі часці 31-й арміі В. В. Глаголева. У вялізным раёне на У ад Мінска сав. войскі акружылі разрозненыя часці 12-га, 27-га, 35-га армейскіх, 39-га і 41-га танкавых карпусоў — усяго больш за 100 тыс. ням.-фаш. салдатаў і афіцэраў з зенітнай колькасцю баявой тэхнікі. Утварыўся т. зв. *Мінскі «кацёл»*. Праследуючы рэшткі фаш. армій, якія адступалі да Нёмана, 1-ы, 2-і і 3-і Беларускія франты часткай сваіх сіл распачалі ліквідацыю мінскай групоўкі ворага і закончылі яе 10—11 ліп. Гітлераўцы страцілі тут 70 тыс. забітымі і больш за 35 тыс. палоннымі, у т. л. 12 генералаў (3 камандзіраў карпусоў і 9 камандзіраў дывізій). 17 ліп. 57 600 немцаў на чале з генераламі і афіцэрамі, узятых у палон пераважна ў час Б. а., былі правакавіраваны па гал. вуліцах Масквы. З разгромам галоўных сіл ням. групы «Цэнтр» утварыўся 400-кіламетровы пралом, закрыць яго вораг не мог. Сав. войскі атрымалі магчымасць наступаць далей.

Наступленне пяхоты ва ўзаемадзеянні з танкамі (раён Мінска).



4 ліп. 1944 Стаўка паставіла новую задачу сав. войскам: уступіць на тэр. Літвы і выйсці да граніц Польшчы. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту 4 ліп. вызвалілі Полацк, выйшлі на подступы да Дзвінска (Даўгаўпілса). Над ням. групай армій «Поўнач» навісла пагроза акружэння. Ломячы ўпартае супраціўленне праціўніка, які атрымаў 5 новых дывізій падмацавання, войскі 2-га



Жыхары Мінска сустракаюць савецкіх танкістаў (ліпень 1944).

1-га Прыбалт. франтоў 22 ліп. авалодалі Паняверыскам, 27 ліп. Дзвінскам і Шаўлямі, 30 ліп. Елгавай (Мітавай), 1 жн. Тукумсам, перарэзаўшы шляхі адступлення праціўніку з Прыбалтыкі ва Усх. Прусію. Войскі 3-га Бел. фронту 5 ліп. вызвалілі Смаргонь, Маладзечна, 13 ліп. — сталіцу Літ. ССР Вільнюс, 15 ліп. фарсіравалі Нёман (гл. *Вільнюсская аперацыя 1944*), 1 жн. вызвалілі Каўнас. Войскі 2-га Беларускага фронту вызвалілі 9 ліп. Навагрудак, 14 ліп. Ваўкавыск, 16 ліп. Гродна, 27 ліп. Беласток і к канцу ліпеня выйшлі на подступы да граніц Усх. Прусіі. Войскі 1-га Бел. фронту 8 ліп. вызвалілі Баранавічы, 10 ліп. Слонім (гл. *Баранавіцка-Слонімская аперацыя 1944*), 14 ліп. Пінск, 23 ліп. Люблін, 28 ліп. Брэст-Літоўск (Брэст) (гл. *Люблінска-Брэсцкая аперацыя 1944*). 20 ліп. войскі 1-га Бел. фронту фарсіравалі Зах. Буг і ўступілі на тэр. Польшчы. У канцы ліпеня яны фарсіравалі р. Нараў і замацаваліся на плацдармах у раёне Серацк і Ражаны; фарсіравалі р. Віслу і захапілі на яе зах. беразе Магнушаўскі і Пулаўскі плацдармы; авалодалі прадмесцем Варшавы — Прагай. 22 ліп. на вызваленай тэр. Польшчы распачаў работу Часовы ўрад Народнай Польшчы — Камітэт нац. вызвалення. Гэты дзень стаў днём нараджэння ПНР. 23 ліп. паміж урадам СССР і Польскім Камітэтам нац. вызвалення заключана пагадненне пра адносіны Сав. Галоўнага камандавання з польскай адміністрацыяй пасля ўступлення сав. войск на тэр. Польшчы. З выхадам сав. войск да граніц Усх. Прусіі і на р. Віслу закончылася В. а.

Вялікую дапамогу сав. войскі мелі ад партызанаў і насельніцтва БССР. На пач. Б. а. на тэр. рэспублікі дзейнічала 150 партыз. брыгад і 49 асобных атрадаў. Іх удзел у Б. а. быў прадугледжаны Стаўкай і загадзя ўзгоднены з дзеючымі франтоў. ЦК КП(б)Б і Беларускі штаб партыз. руху напярэдадні аперацыі паставілі перад партызанамі канкрэтныя задачы, як памагчы Сав. Арміі. За 3 дні да пач. Б. а. партызаны правялі масавае разбурэнне чыг. камунікацый ворага метадам *«рэйкавай вайны»*. У поч на 20.6.1944 адначасовым ударам падарвана больш за 40 тыс. рэек, што паралізавала перавозкі ворага на найважнейшых чыг. магістралях у самы адказны момант. Партызаны пераразалі шляхі адступлення праціўніку, зрывалі яго арганізаваны адыход, разбівалі штабы і гарнізоны, знішчалі жывую сілу і тэхніку, перадавалі сав. камандаванню важныя звесткі; захоплівалі масты, пераправы і ўтрымлівалі іх да падыходу сав. войск; разам з сав. войскамі вызвалялі гарады, мястэчкі і вёскі Беларусі; сваімі сіламі вызваляліі раённыя цэнтры, чыг. станцыі, вёскі, ратуючы іх ад разбурэння, а насельніцтва ад знішчэння і фаш. катаргі. Партызаны захапілі і пабудавалі новыя масты і пераправы цераз рэкі Друць, Ольса, Пціч, Случ, Бярэзіна, Эса, Шчара, Нёман і інш. З часцямі Чырв. Арміі яны вызвалілі Чэрвень, Слуцк, Клічаў, Лупінец, Асіповічы, Баранавічы, Стоўбцы, Маладзечна, Вілейку, Лагойск, Пінск, Плешчаніцы, Браслаў і інш. гарады. Партызаны вызвалілі да падыходу Чырв. Арміі раённыя цэнтры Капыль, Старобін, Узду, Рудзенск, Куранец, Астравец, Ілью, Відзы, Свір, Івянец, Карэлічы, Любчу; чыг. ст. Будслаў, Княгініна, Гудагай і інш. У ліквідацыі акружаных варожых груповак сав. войскам памагалі бел. партызаны (знішчылі больш за 15 тыс. і ўзялі ў палон больш як 17 тыс. гітлераўцаў). У ходзе Б. а. асабліва вызначыліся партыз. брыгады: імя Сталіна (камандзір П. І. *Гулевіч*, камісар Л. Г. *Мурашоў*), «Чэкіст» (камандзір Г. А. *Кірпіч*), партыз. полк № 208 (камандзір Я. М. *Бяспоясаў*, камісар Р. І. *Шчарбакоў*), імя Данукалава (камандзір В. А. *Блахін*, камісар І. І. *Старавойтаў*), імя Шчорса (камандзір В. К. *Дзяруга*, камісар М. П. *Прусак*), 2-я імя Заслонава (камандзір В. П. *Комлеў*, камісар В. Е. *Бялеў*), «Народныя мсціўцы» (камандзір Г. Ф. *Пакроўскі*, камісар М. І. *Пецярэчка*), «Жалязняк» (камандзір І. П. *Цітко*ў, камісар Ф. І. *Дзернушко*ў), «Буравеснік» (камандзір М. Г. *Мармулёў*, камісар І. М. *Рабуха*), імя Аляксандра Неўскага (камандзір А. Г. *Байко*ў, камісар М. М. Гаўрылаў) і інш. (Пра партызанскія брыгады і асобна дзейныя атрады гл. адпаведныя артыкулы.) Удзельнікі камуніст. падполля перадавалі сав. камандаванню звесткі пра абарону праціўніка, паказвалі замініраваныя будынкі, удзельнічалі ў вулічных баях. Увесь бел. народ з радасцю сустракаў вызваліцеляў і памагаў ім чым мог. У многіх раёнах

Салдаты і афіцэры нямецка-фашысцкай арміі, узятыя ў палон у раёне Мінска.



жыхары цэлымі вёскамі выходзілі з партызанамі разбураць камунікацыі ворага. Насельніцтва паказвала сав. войскам варожыя засады, мінныя палі, памагала фарсіраваць водныя перашкоды, вылоўлівала варожых лазутчыкаў і дыверсантаў.

У выніку Б. а. разгромлена ням.-фаш. група армій «Цэнтр», поўнасцю вызвалена Беларусь, большая частка Літвы, частка Латвіі і значная частка Польшчы; Чырв. Армія падышла да граніц Германіі. З 97 дывізій і 13 брыгад праціўніка, што ўдзельнічалі ў баях на бел. зямлі, 30 дывізій поўнасцю знішчаны, астатнія страцілі да 70% асабовага складу і баявой тэхнікі. З 23 чэрв. да 23 ліп. ў ходзе наступлення сав. войск забіта і захоплена ў палон больш як паўмільёна ням. салдатаў і афіцэраў, у т. л. ўзяты ў палон 22 генералы. Спрабуючы спыніць наступленне Чырв. Арміі, гітлераўскае камандаванне перакінула ў Беларусь з інш. участкаў сав.-герм. фронту 19 дывізій і 8 брыгад, з унутраных раёнаў Германіі і акупаваных краін Еўропы 14 дывізій і 5 брыгад, што аблегчыла наступленне сав. войск на інш. стратэгічных напрамках, а таксама наступленне англа-амер. войск у Францыі. Разгром на Беларусі групы армій «Цэнтр» меў велізарнае значэнне для вызвалення Прыбалтыкі, Зах. Украіны, Польшчы і наступлення сав. войск у Германіі. Ням. ген. Бутлер пісаў: «Разгром групы армій «Цэнтр» паклаў канец арганізаванаму супраціўленню немцаў на Усходзе». Б. а. паказала высокі ўзровень сав. ваен. майстэрства, мужнасць, гераізм, высокія маральна-баявыя якасці воінаў. У балх за вызваленне Беларусі выявілася вялікая жыццёвая сіла братняй дружбы народаў нашай краіны, якія прыйшлі на дапамогу бел. народу ў цяжкі для яго час. Гэта перамога ўсяго сав. народа. Яна садзейнічала хуткаму і канчатковаму выгнанню нямецка-фашысцкіх акупантаў з савецкай зямлі. Карпусам (25), дывізіям (94), брыгадам і ўмацаваным раёнам (79), асобным часцям, якія вызначыліся ў ходзе Беларускай аперацыі, нададзены ганаровыя найменні (гл. табл.).

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—1945, т. 4, М., 1962; Тельпуховский Б. С. Великая Отечественная война Советского Союза. 1941—1945, М., 1959; Липпло П. П. КПБ — организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959; Непокоренная Белоруссия, М., 1963; Кравченко И. С. и Залесский А. И. Белорусский народ в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959; Полки идут на запад, М., 1964; Освобождение Белоруссии, М., 1970; Маланьин К. А. Разгром фашистских войск в Белоруссии, М., 1956; Рокоссовский К. К. Солдатский долг, М., 1968; Жуков Г. К. Воспоминания и размышления, М., 1969; Штеменко С. М. Генеральный штаб в годы войны, М., 1968; Сообщения Советского Информбюро, т. 7, М., 1945; Типпельскирх К. История второй мировой войны, пер. с нем., М., 1956; Фуллер Дж. Ф. С. Вторая мировая война 1939—1945 гг., пер. с англ., М., 1956; Мировая война. 1939—1945 гг. Сб. ст., пер. с нем., М., 1957; Меллентин Ф. В. Танковые сражения 1939—1945 гг., пер. с англ., М., 1957; Верт А. Россия в войне 1941—1945, пер. с англ., М., 1967; Диксон Ч. О. и Гейльбрунн О. Коммунистические партизанские действия, пер. с англ., М., 1957.

У. І. Лемяшонак. Мінск.

Ганаровыя найменні, нададзеныя злучэнням і часцям у ходзе Беларускай аперацыі

Ганаровыя найменні	Колькасць				
	карпусоў	дывізій	брыгад і ўмацаваных раёнаў	асобных часцей	усяго
«Віцебскія»	1	24	7	30	62
«Жлобінскія»	—	1	1	1	3
«Слуцкія»	—	1	2	5	8
«Бабруйскія»	3	5	5	7	20
«Аршанскія»	1	8	5	27	41
«Верхнедняпроўскія»	—	7	6	19	32
«Магілёўскія»	—	3	7	11	21
«Барысаўскія»	—	4	—	9	13
«Мінскія»	2	2	4	44	52
«Полацкія»	—	4	4	23	31
«Маладзечанскія»	—	1	2	10	13
«Ковельскія»	—	4	1	4	9
«Лунінецкія»	—	—	1	6	7
«Пінскія»	—	2	1	15	18
«Віленскія»	—	1	3	16	20
«Ваўкавыскія»	—	1	2	8	11
«Гродзенскія»	1	1	—	15	17
«Кобрынскія»	—	—	—	12	12
«Лідскія»	—	1	—	3	4
«Баранавіцкія»	1	5	2	20	28
«Слонімскія»	—	1	2	8	11
«Люблінскія»	3	1	3	9	16
«Дамброўскія»	—	2	—	16	18
«Беластоцкія»	—	1	1	22	24
«Пазнанскія»	—	—	—	5	5
«Брэсцкія»	4	5	9	29	47
«Мітаўскія»	—	—	—	13	13
«Шаўлінскія»	—	1	3	6	10
«Седлецкія»	1	2	1	13	17
«Нёманскія»	6	4	6	28	44
«Ковенскія»	2	1	1	17	21
«Асавецкія»	—	1	—	13	14

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ПРАЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ПАЭТАЎ (БелАПП). Узнікла ў выніку рэарганізацыі *«Маладняка»*. Пастанову пра стварэнне БелАПП прыняў Усебеларускі з'езд «Маладняка» (25—28.11.1928). Чл.: А. Александровіч, А. Астрэйка, П. Броўка, П. Галавач, А. Звонак, А. Куляшоў, М. Лынькоў, Р. Мурашка, Я. Скрыган, П. Трус, М. Хведаровіч, Х. Шыклер і інш. Адыграла значную ролю ў стварэнні пралетарскай л-ры, з'яднанні пісьменніцкіх сіл, наладжванні сувязей з л-рамі народаў СССР. Адстойвала прынцыпы партыйнасці і камуніст. ідэйнасці л-ры, змагалася з варожымі ўплывамі ў маст. творчасці, патрабавала ад пісьменнікаў актыўнага ўдзелу ў жыцці гр-ва, арыентавала іх на тэмы сацыяліст. буд-ва. У дзейнасці арг-цыі былі праявы групаўшчыны, адасобленасці і замкнёнасці, прэтэнзіі на становішча гегемона ў л-ры, пагардлівыя адносіны да прадстаўнікоў іншых пісьменніцкіх арг-цый. Адмоўна ўплывала на развіццё бел. сав. л-ры белапаўская вульгарнасацыялаг. крытыка (Л. Бэндэ і інш.). Мела філіі (Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую, Полацкую, Гомельскую), якія выдавалі свае альманахі; секцыі — рускую, польскую, літоўскую, яўрэйскую. Ліквідавана 27.5.1932 пастановай ЦК КП(б)Б «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР».

Літ.: Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 1, Мн., 1965, с. 591—603; Шпыркоў Ю. С. Беларуская савецкая проза (20-я — пачатак 30-х гадоў), Мн., 1960, с. 84—87. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ ВАЕННАЯ АКРУГА (БВА), ваенна-адміністрацыйнае аб'яднанне вайсковых часцей, злучэнняў, ваенных навучальных і іншых ваен. устаноў, мясцовых улікова-мабілізацыйных органаў (ваенкаматаў), якія дыслацыруюцца на тэрыторыі БССР.

Утворана 28.11.1918. Спачатку наз. Мінскай, з 14.12.1918 Заходняй ваен. акругай, у склад якой уваходзілі Мінская, Смаленская, Віцебская, Магілёўская і Віленская губ. Органы ваен.-адм. кіравання на тэр. акругі з 30.1.1919: Акруговы ваен. камісарыят, Ваенна-акруговы штаб. У жн. 1919 Акруговы ваен. камісарыят быў падначалены Рэўваенсавету Зах. фронту (для абароны зах. раёнаў Сав. Рэспублікі ў крас. 1918 створаны спачатку Зах. заслона, потым Зах. раён абароны, ператвораны ў Зах. армію, з 19.2.1919 — у Зах. фронт). У грамадз. вайну войскі Зах. фронту пры падтрымцы працоўных адстаялі заваёвы Кастр. рэв. на Беларусі. Асаблівую ролю адыгралі яны ў разгроме польскіх інтэрвентаў у 1920. Пасля заканчэння баявых дзеянняў Зах. ваен. акруга ўлілася ў склад Зах. фронту. 8.4.1924 фронт перайменаваны ў Зах. ваен. акругу, якая з 1926 наз. Бел. ваен. акругай (БВА), з 1938 Бел. асобай ваен. акругай, з 1940 Зах. асобай ваен. акругай. У вер. 1939 войскі акругі (Беларускі фронт) удзельнічалі ў вызваленні Зах. Беларусі ад прыгнёту буржуазіі. Польшчы. Упраўленне акругі ў 1939 пераведзена з Смаленска ў Мінск.

У пач. Айч. вайны акруга зноў ператворана ў Зах. фронт. Войскі фронту ў цяжкіх баях у раёне Гродна, Брэста, Слоніма, Мінска, на Бярэзіне і Дняпры, пад Смаленскам прычынілі ням.-фаш. захопнікам значныя страты, сарвалі іх планы маланкавага наступлення на Зах. напрамку. Неўміручы подзвіг здзейснілі абаронцы Брэсцкай крэпасці і Магілёва. Войскі Зах. фронту ўдзельнічалі ў разгроме фаш. полчышчаў пад Масквой, у Смаленскай наступальнай аперацыі (1943). 24.4.1944 Зах. фронт перайменаваны ў 3-і Беларускі фронт, войскі якога ўдзельнічалі ў *Беларускай аперацыі 1944*, а на заключным этапе Айч. вайны — ва Усх.-прускай аперацыі. Сотні тысяч салдатаў, афіцэраў і генералаў Зах. (3-га Беларускага) фронту ўзнаг. ордэнамі і медалямі СССР, больш як 400 воінам прысвоена званне Героя Сав. Саюза.

Пасля вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў ўтворана Бел.-Літоўская ваен. акруга. У ліп. 1945 яна падзелена на 2 акругі: Мінскую (аб'яднала Мінскую, Полацкую, Маладзечанскую, Віцебскую і Магілёўскую вобл., упраўленне ў Мінску) і Баранавіцкую (аб'яднала Баранавіцкую, Брэсцкую, Гродзенскую, Пінскую, Бабруйскую, Палескую і Гомельскую вобл., упраўленне ў Бабруйску). У сак. 1946 яны аб'яднаны ў адну акругу — БВА (упраўленне спачатку ў Бабруйску, са студз. 1947 у Мінску). Акруговая газ. *«Во славу Родины»*. З гісторыяй БВА звязаны імёны выдатных дзеячаў Камуніст. партыі і Сав. дзяржавы: М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікова, Р. К. Арджанікідзе. У БВА служылі вядомыя сав. ваен. дзеячы Я. Ф. Фабрыцыус, Я. А. Адамовіч, А. С. Бурдзейны, Р. І. Бераін, І. І. Вацэціс, К. К. Ракасоўскі, Р. Я. Маліноўскі, А. А. Грэчка, Л. А. Говараў, М. І. Крылоў, В. І. Чуйкоў, М. В. Захараў, К. А. Мерацкоў і інш. 22.2.1968 БВА ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Войскі акругі ўдзельнічалі ў вучэннях і манеўрах «Дняпро» (1967), «Нёман» (1968), «Дзвіна» (1970).

У розны час войскамі акругі (фронтоў) камандавалі: Е. З. Барсукоў (1918), М. М. Дамажыраў (1919), Дз. М. Надзежны (1919), У. М. Гіціс (1919—20), М. М. Тухачэўскі (1920—21, 1922—24), П. М. Захараў (1921), А. І. Ягораў (1921—22, 1927—31), А. І. Кук (1924), А. І. Корк (1924—27), І. П. Убарэвіч (1931—37), І. П. Бялоў (1937), М. П. Кавалёў (1938—40), Дз. Р. Паўлаў (1940—41), А. І. Яроменка (1941), С. К. Цімашэнка (1941, 1945—46, 1949—60), І. С. Конеў (1941, 1942—43), Г. К. Жукаў (1941—42), В. Дз. Сакалоўскі (1943—44), І. Д. Чарняхоўскі (1944—45), А. М. Васілеўскі (1945), І. Х. Баграмян (1945), С. Г. Трафімянка (1946—49), В. М. Камароў (1960—61), В. А. Пянькоўскі (1961—64), С. С. Марахін (1964—67). З 1968 камандуючы акругі І. М. Трацяк.

Літ.: Страницы героической истории, Мн., 1968; Будни Белорусского Краснознаменного, Мн., 1969; Маневры «Двина», Мн., 1970.

Б. Б. Вашчанка. Масква; *Н. Г. Конюхай.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ ВАЙСКОВАЯ РАДА (Цэнтральная вайсковая рада), контррэвалюцыйная нацыяналістычная арганізацыя. Афармілася ў кастр.— ліст. 1917 з прадстаўнікоў бел. вайсковых арг-цый. 30.1.1918 за контррэвалюц. дзейнасць і падтрымку антысав. мяцежу польскага корпуса Даўбор-Мусніцкага распушчана СНК Зах. вобл. і фронту.

«БЕЛАРУСКАЯ ВЕТЭРЫНАРЫЯ», часопіс навуковай, практычнай і прафесіянальнай ветэрынарыі. Выдаваўся Беларускім н.-д. вет. ін-там у 1924 у Мінску, у 1925—29 у Віцебску. Выйшлі: у 1924 адзін нумар, у 1925—26 па 4 нумары, у 1927—29 па 12 нумароў на год. У 1924—27 друкаваўся на рус. мове, у 1928—29 змяшчаў матэрыялы на бел. і рус. мовах. Асвятляў пытанні тэорыі і практыкі ветэрынарыі, вет. адукацыі, прафілактыкі хвароб жывёлы; папулярызаваў сярод сялян веды па ветэрынарыі і жывёлагадоўлі; новыя формы арганізацыі вет. справы. У «Б. в.» друкаваліся працы бел. вучоных А. М. Макараўскага, С. М. Вышалескага, А. А. Шлітара, А. І. Барадзёнка, К. Г. Галенскага, С. М. Смірэнскага. Рэдактар Я. П. *Алонаў*.


«БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА», масавая сялянская газета, якая выдавалася ў Мінску з лют. 1921 на рус. мове («Белорусская деревня») дадаткам да газ. «Звезда» (гл. *«Звязда»*); з сак. 1924 самастойная газета на бел. мове, орган Мінскага акр. к-та КП(б)Б і Мінскага акр. выканкома, з 1925 орган ЦК і Мінскага акр. к-та КП(б)Б. Выходзіла два, з 1929 тры разы на тыдзень. Тыраж ад 4600 (1925) да 58 тыс. экз. (1929). Пастаянныя аддзелы: Сельская гаспадарка, Камуністы на вёсцы,

Народная асвета, Куток селькора, Запытанні і адказы, Па Чырвоным Саюзе, З Заходняй Беларусі, Што робіцца на свеце. Асвятляла работу сельскіх Саветаў, камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, кааперацыі, жыццё моладзі, сялянак. З пачаткам калектывізацыі прапагандавала перавагі супольнай гаспадаркі, заклікала сяляні аб'ядноўвацца ў калгасы, выкрывала шкодніцкую дзейнасць кулакоў. На старонках «Б. в.» выступалі В. Г. Кнорын, М. М. Галадзед, А. Р. Чарвякоў, Я. Б. Гамарнік і інш. парт. і дзярж. дзеячы БССР, бел. пісьменнікі З. Бядуля, К. Чорны, К. Крапіва, П. Трус і інш. Выпускала дадаткі: «Чырвоны сейбіт» (гл. *Літаратурныя дадаткі*), «Спажывецкая кааперацыя», «Беларускі пчаляр» і інш. Рэдактары: С. Г. *Булат*, Р. К. *Шукевіч-Трацякоў*. У 1931 перайменавана ў *«Калгаснік Беларусі»*.

Літ.: Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1968, с. 164—166; Из истории партийно-советской печати Белоруссии, Мн., 1960.
А. І. Марозава. Мінск.

«БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА», легальны неафіцыйны орган КПЗБ. Выходзіла ў Вільні неперыядычна з 8.6.1933 да 30.1.1934 на бел. мове. Рэдактар-выдавец А. Карповіч. Ідэйны кірунак газеце надавалі прадстаўнікі ЦК КПЗБ В. Эпштэйн (Даніла), В. Таўлай (Васіль), П. Зубовіч (Юрка). Выступала супраць пац. ўціску, акупац. рэжыму, фашызацыі грамадскага жыцця бурж. Польшчы, крытыкавала палітыку і дзейнасць *беларускай санацыі, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* (БХД) і інш. дробнабуржуазных нацыяналіст. партый, амагалася за ўз'яднанне Зах. Беларусі з БССР. Згуртоўвала прагрэс. літ. сілы на аснове прынцыпаў класавасці, народнасці і камуніст. партыйнасці мастацтва. Выдавала «Літаратурныя старонкі», у якіх выступалі бел. пісьменнікі П. Пестрак, А. Дубровіч, М. Васілёк, П. Граніт, М. Явар і інш. Склікала 10.12.1933 нелегальны з'езд зах.-бел. пісьменнікаў у Вільні, на якім быў створаны Літ. фронт сялянскіх і рабочых пісьменнікаў Зах. Беларусі. Асобныя нумары і многія артыкулы «Б. г.» канфіскоўваліся ўладамі бурж. Польшчы. На 17-м нумары газета забаронена; найбольш актыўныя супрацоўнікі арыштаваны і пасля двухгадовага следства засуджаны.
У. А. Калеснік. Брэст.

БЕЛАРУСКАЯ ГРАДА, шырокая палоса градава-ўзгорыстага рэльефу, якая цягнецца ад зах. граніцы БССР (каля Гродна) на ўсход за Оршу (паміж Дняпром і Зах. Дзвіною). Складзена з марэнных, часткова з водналедавіковых напосаў. Згладжаная, месцамі значна врэзана цякучымі водамі. Пераважаюць выш. 200—250 *м* над узр. м. Найвыш. пункт г. Дзяржынская (346 *м* над узр. м.). Многа далін, схілы якіх парэзаны ярамі. Б. г. дзеліцца на ўзвышшы: Гродзенскае, Ваўкавыскае, Слонімскае, Навагрудскае, Ашмянскае, Мінскае, Аршанскае. Глебы дзярнова-падзолістыя сугліністыя і супесчаныя завалуненыя, пылавата-сугліністыя, сям-там змытыя па схілах. Невялікія, пераважна хваёвыя, лясы займаюць 25% тэр. Б. г. Пад пашай 40—50% тэр. Асн. культуры: жыта, бульба, кармавыя, лён, месцамі пшаніца, на З цукр. буракі, махорка. Мінер. сыравіна — цагельная гліна, мел, мергель, буд. пясок, валунна-галечны матэрыял, торф.


Беларуская града каля Лагойска.

БЕЛАРУСКАЯ ГУБЕРНІЯ, адм.-тэр. адзінка, утвораная паводле ўказу Паўла I ад 12.12.1796 замест скасаваных *Полацкай губерні* і *Магілёўскай губерні*. Уключала 16 паветаў: Віцебскі, Полацкі, Гарадоцкі, Веліжскі, Невельскі, Себежскі, Люцынскі, Дынабургскі, Сеннеңскі, Аршанскі, Магілёўскі, Чавускі, Мсціслаўскі, Чэрыкаўскі, Рагачоўскі, Беліцкі; губернскі горад — Віцебск; жыло ў Б. г. 675,6 тыс. чал. (1797). Указам Аляксандра I ад 27.2.1802 падзелена на *Віцебскую губернію* і Магілёўскую губ.

Кр.: Полное собрание законов Российской империи с 1649 г., СПб., 1830, т. 24, арт. 17634, 17702, т. 27, арт. 20162; Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 3 — Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII — первой половине XIX в. (1772—1860), Мн., 1961.


«БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ», газета, цэнтральны орган нацыянальнай фракцыі дэпутатаў Зах. Беларусі ў польскім сейме — *Беларускага пасольскага клуба*. Выдавалася ў Вільні на бел. мове з 11.1 да 21.5.1925. Выйшла 36 нумароў. Пісала пра нац. прыгнёт, бяспраўнасць беларусаў, хваляванні бел. сялян і батракоў у Зах. Беларусі, пра дасягненні працоўных БССР. Сацыяльна-паліт. неадпаведнасць Бел. пасольскага клуба ў польскім сейме абумовіла хісткасць паліт. кірунку газеты: ад апазіцыі ўраду бурж.-памешчыцкай Польшчы да згоды з ім. Радыкальнага кірунку «Б. д.» прытрымлівалася ў пэўнай ступені дзякуючы таму, што ў яе рэдкалегіі супрацоўнічалі Б. А. *Тарашкевіч* і С. А. *Рак-Міхайлоўскі*. Польскія ўлады некалькі разоў спынялі выданне, нумары 9, 27, 35/36 былі забаронены.

БЕЛАРУСКАЯ ДОСЛЕДНАЯ СТАНЦЫЯ ПА ПТУШКАГАДОЎЛІ заснавальная, навукова-даследчая ўстанова ў г. п. *Заслаўе* Мінскай вобл. Арганізавана ў 1968. Распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні птушкагадоўлі. Дырэктар станцыі — канд. с.-г. навук З. В. Фокіна (з 1968). Аддзелы: селекцыйна-генетычны; кармлення птушак. Мае эксперымент. гаспадарку. Асн. праблематыка даследаванняў: акліматызацыя айчынных і імпартных парод і ліній птушак, іх удасканаленне, стварэнне новых парод і ліній, дапамога племянным гаспадаркам рэспублікі ў вывядзенні высокапрадукцыйных гібрыдных птушак.

БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТЫЧНАЯ СТУДЫЯ ў Маскве, арганізавана ў лістападзе 1921 для падрыхтоўкі нацыянальных акцёрскіх кадраў. З 1923 існуе на правах ВНУ. Маст. кіраўнік А. Бондараў, з 1922 В. *Смышляеў*; педагогі — Б. Афоніп, А. Гейрот, М. Успенская, С. *Гіяцынтава*, В. Громаў. Спектаклі: нар. драма «Цар Максіміліян», «Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра, «Апраметная» В. Шашалевіча, «Вакханкі» Еўрыпіда, «Эрос і Псіхея» Ю. Жулаўскага, «Астап» А. Глобы і «У мінулы час» І. Бэна. У 1926 на аснове Бел. студыі створаны БДТ-2 *(Беларускі тэатр імя Якуба Коласа)*. Студыю скончыла 34 чал., у т. л. Т. Бандарчык, В. Барысевіч, М. Бялінская, З. Вялікі, Л. Геппер, Я. Глебаўская, А. Ільінскі, Р. Кашэльнікава, А. Лагоўская, Л. Мазалеўская, П. Малчанаў, М. Міцкевіч, А. Радзялоўская, К. Саннікаў, С. Скальскі, С. Станюта, С. Стэльмах, М. Сянько, Ц. Сяргейчык, Л. Шынко.

Літ.: Нефед В. Становление белорусского советского театра, Мн., 1965, с. 131—142; Сяргейчык Ц. Нататкі акцёра, Мн., 1966, с. 94—110.

БЕЛАРУСКАЯ ДРЭС (дзяржаўная раённая электрастанцыя), першая эл. станцыя на Беларусі, пабудаваная ў перыяд ажыццяўлення плана ГОЭЛРО. Паліва — торф. Буд-ва пачалося ў 1927 каля в. Арэхі Аршанскага р-на на Асінаўскіх балотах (адсюль яе ранейшая назва Асінаўская ДРЭС). У ліст. 1930 першая чарга станцыі дала прамысл. ток прадпрыемствам Віцебскай і Магілёўскай абл. Праектная магутнасці (32 тыс. *квт*) дасягнула да 1941. У Айч. вайну разбурана. У 1946 здадзены ў эксплуатацыю першы турбагенератар. Поўнасцю адноўлена ў 1951 (магутнасць 34 500 *квт*). Побач з эл. станцыяй г. Арэхаўск.
Л. М. Сідарэнка. Арэхаўск.


Агульны выгляд Беларускай ДРЭС.

БЕЛАРУСКАЯ ДЭПУТАЦКАЯ ФРАКЦЫЯ барацьбы за інтарэсы сялян і рабочых «Змаганне». Гл. *«Змаганне»*.

«БЕЛАРУСКАЯ ЗВЯЗДА», газета, орган Палітупраўлення Беларускага фронту. Выдавалася на бел. мове ў вер.— кастр. 1939, у дні вызвалення зах. абласцей Беларусі з-пад улады бурж.-памешчыцкай Польшчы. Пісала пра ролю Чырв. Арміі ў вызваленні працоўных Зах. Беларусі, пра дасягненні СССР і БССР. У газеце працавалі і друкаваліся бел. пісьменнікі П. Броўка, П. Глебка, І. Гурскі, П. Панчанка. Рэдактар М. Лынькоў.

БЕЛАРУСКАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ (Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага), вышэйшая музычная навучальная ўстанова.


Будынак Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Засн. ў ліст. 1932 у Мінску. Імя Луначарскага прысвоена 4.1.1934. У час Айч. вайны не працавала. Аднавіла дзейнасць у 1944. Рыхтуе спецыялістаў: з 1932 — па фартэпіяна, аркестравых інструментах, спевах, кампазіцыі, музыказнаўстве: з 1934 — па харавым дырыжыраванні; з 1937 — па нар. інструментах; з 1966 — па оперна-сімф. дырыжыраванні. Факультэты ў 1969/70 навуч. г.: кампазіцыі і музыказнаўства, выканаўчы. Есць завочнае адд., аспірантура з 1963. Пры кансерваторыі спец. муз. школа, оперная студыя.

Прафесары (на 1.1.1970): М. Аладаў, А. Багатыроў (выпускнік кансерваторыі), М. Бергер, В. Гольдфельд, І. Жыновіч (выпускнік кансерваторыі). Сярод выпускнікоў бел. кампазітары: засл. дзеячы маст. БССР Г. Вагнер, Я. Глебаў, Дз. Лукас, П. Падкавыраў, В. Яфімаў, засл. артысты БССР М. Крошнер, І. Лучанок, Дз. Смольскі; выканаўцы: нар. арт. СССР М. Ворвулеў, нар. арт. БССР Т. Шымко, нар. арт. БССР В. Глушакоў, засл. арт. БССР В. Бурковіч і інш. Рэктар засл. дз. маст. БССР У. Алоўнікаў (з 1962).
К. І. Сцепанцэвіч. Мінск.

«БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА» (Bielaruskaja krynica»), штотыднёвая клерыкальная газета бурж.-нацыяналіст. кірунку, орган *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* (БХД). Разлічана была пераважна на беларусаў-католікаў. Выдавалася на бел. мове з 8.10.1917 у Петраградзе, № 3 за 1918 у Мінску, з 7.9.1919

да 12.7.1940 у Вільні. Да 1925 і з 17.11.1939 наз. «Крыніца». Выйшла 768 нумароў. «Б. к.» пісала пра нац. ўціск, беспрацоўе, сялянскія і студэнцкія хваляванні ў Зах. Беларусі, але і студэнцкія хваляванні ў Зах. Беларусі, але і студэнцкія хваляванні ў Зах. Беларусі, але і студэнцкія хваляванні ў Зах. Беларусі, але варожа ставілася да камуніст. і рэвалюц. руху, да СССР. Друкавалася то лацінкай, то кірыліцай, у 1934—39 абодвума шрыфтамі адначасова. *Н. А. Ляшковіч.* Вільнюс.

«БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА», штомесячны літаратурна-грамадскі часопіс палянафільскага, згодніцкага кірунку, які выдаваўся ў Вільні па бел. мове з ліп. да вер. 1927. Быў разлічаны на інтэлігенцыю. Выйшла тры нумары ў дзвюх кнігах. У раздз. «Бібліяграфія» друкаваў спіс кніг, якія выдаваліся ў Вільні на бел. мове. Рэдактар і выдавец «Б. к.» Ф. Умястоўскі праводзіў палітыку супрацоўніцтва з польскімі бурж.-памешчыцкімі ўладамі, накіраваную супраць нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі.

«БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КАМУНА», аб'яднанне беларускіх савецкіх пісьменнікаў. Створана ў вер. 1927 у Мінску. Члены: А. Атава (Канановіч), П. Броўка, У. Варава, А. Вясёлы, А. Куляшоў, Ю. Лявонны, Б. Мікуліч, С. Мялешка, У. Прыбыткоўскі, Я. Відук (Скрыган), Я. Сукала, М. Шалаеў, П. Шукайла. Выдала 2 нумары час. «Росквіт» (1927—28). У крас. 1928 самаліквідавалася.

Літ.: Скрыган Я. Кругі. Выбранае, Мн., 1969, с. 79—83.

«БЕЛАРУСКАЯ МЕДЫЧНАЯ ДУМКА», медыцынскі часопіс, орган Наркамата аховы здароўя БССР. Выдаваўся з вер. 1924 да жн. 1929 у Мінску, у 1924 на рускай, у 1925—29 на бел. і рус. мовах. Асвятляў пытанні аховы здароўя, развіцця лячэбнай сеткі ў рэспубліцы, санітарыі, гігіены, эпідэміялогіі, прафілактыкі. Друкаваў працы па краявой паталогіі, эксперымент. медыцыне, біялогіі; артыкулы пра мед. адукацыю і ўрачэбную практыку; агляды, рэфераты, рэцэнзіі на мед. выданні; хроніку мед. жыцця. Рэдактарам «Б. м. д.» і аўтарам многіх артыкулаў быў нарком аховы здароўя БССР М. І. *Барсукоў.*

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, мова асноўнага насельніцтва Беларускай ССР — *беларусаў.* У СССР Б. м. лічаць роднай 7,9 млн. чал. (1959, перапіс). З рускай і ўкраінскай складае ўсх. групу *славянскіх моў.* Некат. граматычнымі і лексічнымі асаблівасцямі збліжаецца з зах.-слав. мовамі. У ёй больш, як у рускай, старажытных грамат. і лексічных рысаў. Сучасная Б. м. існуе ў дыялект. і літ. формах. Дыялектная Б. м. выходзіць за адм. межы рэспублікі (суседнія раёны Літ. і Латв. ССР, Смаленшчыны і Браншчыны, Беластоцкага ваяводства). У сваю чаргу мовы суседніх славянскіх народаў уплываюць на гаворкі насельніцтва пагранічных раёнаў Беларусі. Літ. мова генетычна грунтуецца на гаворках цэнтр. часткі Беларусі, але ў працэсе развіцця сінтэзавала самыя характэрныя для большасці бел. гаворак грамат. і лексічныя рысы і поўнасцю не супадае з якім-н. тэр. дыялектам.

У бел. літ. мове 5 галосных фанем, якія выступаюць у 6 гуках: «а», «э», «о», «у», «і(ы)». Для абазначэння іх на пісьме *беларускі алфавіт* мае 10 літар: «а», «о», «у», «э», «і», «ы», «я», «ё», «ю», «е». У моўным патоку галосныя змяняюцца ў залежнасці ад націску і характару суседніх зычных. Найважнейшыя пазіцыйныя змены галосных: *аканне* («воды — вада»), яканне («сцены — сцяна») і прыстаўныя галосныя («лён — ільнавод»); гістарычныя змены: пераход «о» ў «о(ё)» («дзень — дзён») і чаргаванне «о» і «е» з нулём гука («сон — сну», «пень — пня»). У сістэме зычных 32 фанемы, яны рэалізуюцца ў 39 гуках: «п — п'», «б — б'», «м — м'», «в(ў) — в'(ў')», «ф — ф'», «д — дз'», «т — ц'», «з — з'», «с — с'», «л(ў) — л'», «н — н'», («дз'), «ц», «ж», «ш», «дж», «ч», «р», «j», «г» («г — г' фрыкатыўныя, «г — г'» выбухныя), «х(х')», «к(к')». Зычныя на пісьме абазначаюцца 21 літарай («б», «в», «г», «д», «ж», «з», «й», «к», «л», «м», «н», «п», «р», «с», «т», «ў», «ф», «х», «ц», «ч», «ш») і двума дыграфамі («дз», «дж»). У галіне зычных жывыя фанет. змены — розныя віды асіміляцыі: аглушэнне звонкіх перад глухімі («казаць — каска», «дзяжа — дзешка»), азванчэнне глухіх перад звонкімі («малаціць — маладзьба», «праціць — прозьба»), змякчэнне цвёрдых зычных перад мяккімі («два — дзьве»), змяненне свісцячых у шыпячыя («вазіць — перавошчык») і шыпячых у свісцячыя («мыеш — мыесься»). Да пазіцыйных змен адносяцца таксама аглушэнне звонкіх на канцы слоў («дуп — дуб», «нош — нож»), прыстаўныя зычныя («азёры — возера») і пераход «в» у «ў» («трава — траўка»). Найважнейшыя гістар. змены: падаўжэнне некат. зычных на месцы былога спалучэння «зычны + ь» («вяселле», «збожжа»), замена «л» на «ў» («былі — быў») і разнастайныя чаргаванні («нага — назе», «касіць — кашу», «купіць — куплю», «крык — крычу» і інш.).

Б. м. ўласціва сінтэтычная, ці флектыўная, марфалогія: канчаткамі назоўнікаў, займенікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў і дзеясловаў вызначаюцца грамат. форма слова і яго сінтакс. роля. Аднак ёсць і элементы аналіт. ладу: аналітычна ўтвараюцца ступені параўнання некат. прыметнікаў («самы лепшы») і прыслоўяў («найбольш поўна») і асабліва дзеяслоўныя формы: будучы час незакончанага трывання («буду пісаць»), умоўны лад («схадзіў бы»), рэшткі плюсквамперфекта («пайшоў быў») і некат. формы загаднага ладу («давай працаваць», «няхай чытае»). Паводле лексіка-грамат. прынцыпу назоўнікі падзяляюцца на канкрэтныя і абстрактныя, уласныя і агульныя, зборныя і рэчыўныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя. Ім уласцівыя катэгорыі роду, ліку і склону. Назоўнікі размяркоўваюцца па трох тыпах скланення, асобна вылучаецца невялікая група разнаскланяльных назоўнікаў, якія маюць неадпаведнасці асновы ў асобных склонавых формах. Па-за сістэмай скланення ў літ. мове астаюцца некат. іншамоўныя словы з галосным на канцы («бюро», «жюры», «рагу»). Паводле значэння прыметнікі падзяляюцца на якасныя і адносныя, у склад адносных уключаюцца і прыналежныя (часам выдзяляюцца асобна). Грамат. формы прыметнікаў (род, лік і склон) не самастойныя, яны залежаць ад назоўнікаў, да якіх дапасуюцца прыметнікі. Якасныя прыметнікі ўтвараюць простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы ступеняў параўнання. Асабліва багатая грамат. сістэма ў дзеяслова, дзе адрозніваюцца спрагальныя і неспрагальныя формы. У спрагальных формах дзеяслоў змяняецца па асобах, ліках, трыванні, часах і ладах. Да неспрагальных належаць *інфінітыў, дзеепрыметнік* і *дзеепрыслоўе.* Інфінітывы і дзеепрыслоўі не маюць формаў словазмянення, а дзеепрыметнікі, як і прыметнікі, змяняюцца па родах, ліках і склонах. Назоўнік, прыметнік і дзеяслоў вызначаюцца разнастайнасцю канчаткаў. Канчаткі займенікаў і лічэбнікаў звычайна супадаюць з канчаткамі назоўнікаў і прыметнікаў. Усе словы Б. м. размяркоўваюцца на дзесяць часцін мовы: *назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў* і *прыслоўе* (знамянальныя), *прыназоўнік, злучнік, часціцы* і *выклічнік* (службовыя). Знамянальныя (за выключэннем прыслоўяў) маюць формы словазмянення.

Сінтаксіс Б. м. ў асноўных сваіх рысах агульны з сінтаксісам рус., укр. і іншых слав. моў. Спецыфіку бел. сінтаксісу надаюць гал. ч. асаблівасці ў дзеяслоўным і прыназоўнікавым кіраванні і ў структуры словазлучэнняў.

У слоўнікавым складзе Б. м. тры асноўныя гістар. пласты: агульнаславянская і агульнаўсходнеславянская лексіка; уласнабеларускія новаўтварэнні; запазычанні.

Ядро слоўнікавага складу Б. м.— агульнаславянская лексіка; яна ўключае назвы з'яў прыроды («вецер», «гром», «дождж»), рэльефу і мясцовасці («гара», «лес», «поле»), адрэзкаў часу («дзень», «ноч», «зіма»), карысных выкапняў («гліна», «жалеза», «соль»), раслін («бяроза», «дуб», «мох»), птушак і жывёлін («варона», «воўк», «мядзведзь»), частак чалавечага цела («галава», «нага», «рука»), ступеняў сваяцтва («брат», «сын», «унук»), паняццяў гасп. дзейнасці («барана», «гумно», «жыта»), пачуццяў і духоўных здольнасцей чалавека («воля», «радасць», «розум»), дзеянняў і працэсаў («браць», «ісці», «пасціць»), прымет-якасцей («белы», «новы», «чысты») і г. д. Большая частка такіх слоў пашырана на ўсёй слав. моўнай тэрыторыі: адзенні паміж імі толькі ў вымаўленні. У старажрус. эпоху слоўнікавы склад папоўніўся шматлікімі агульнаўсх.-слав. неалагізмамі («волат», «дзевяноста», «коўш») і запазычаннямі з грэч., старослав., скандынаўскіх і цюркскіх моў. Уласнабеларускія новаўтварэнні ўзніклі пераважна з агульнаслав. каранёў з выкарыстаннем пашыраных у Б. м. словаўтваральных сродкаў — суфіксаў і прыставак. Пры гэтым прадуктыўнасць пасобных словаўтваральных сродкаў неаднолькавая ў параўнанні, напр., з рус. мовай. Так, у Б. м. вельмі прадуктыўны суфікс «-нік» пры ўтварэнні назваў асоб паводле роду іх заняткаў і дзейнасці («пісьменнік») і прадметаў паводле іх прызначэння («выключальнік»). Многім рус. словам з суфіксам «-тель» у Б. м. адпавядаюць утварэнні з суфіксам «-ач» («слушатель» — «слухач», «читатель» — «чытач») ці «-біт» («носитель» — «носьбіт», «сеятель» — «сейбіт»). Рус. дзеяслоўная прыстаўка «из-» раўназначная бел. прыстаўкам «вы-» («издать» — «выдаць»), «з-» («измерить» — «замераць») і «па-» («избавить» — «пазбавіць»). Адрозненне словаўтваральных сродкаў рус. і бел. моў асабліва вылучаецца пры прэфіксальна-суфіксальным словаўтварэнні («издательство» — «выдавецтва», «заместитель» — «намеснік»). Акрамя афіксацыі, у сучаснай Б. м. актыўна дзейнічаюць словаскладанне («бульбакапалка», «птушкаферма», «станкабудаванне») і абрэвіяцыя («БССР», «калгас», «партбюро»). Запазычанні Б. м. ў залежнасці ад часу, шляхоў пранікнення і тэматычнай характарыстыкі падзяляюцца на даўнія і сучасныя. Сярод даўніх пэўнае месца займаюць паланізмы («кабета», «моц», «пан», «праца», «хлопец»). Праз польскую мову, а часткова і непасрэдна з нямецкай праніклі ням. словы («дах», «ланцуг», «ліхтар», «фарба», «цэгла»). Ёсць таксама і лацінізмы («аркуш», «артыкул», «водар», «гонар»). Сучасныя запазычанні складаюць пераважна *інтэрнацыянальную лексіку.* Асноўу іх утвараюць запазычанні з грэч. і лац. моў або штучныя новаўтварэнні на базе словатворчых марфем гэтых моў. Сярод запазычанай лексікі сучаснай Б. м. многа рускіх, а таксама англ., ням., франц., італьян.,ісп. і інш. слоў у галіне навук., тэхн. і сацыяльна-эканам. тэрміналогіі, якія найчасцей прыходзяць праз рускую мову і якой-небудзь спецыфікі слоўнікаваму складу Б. м. не надаюць.

Дыялектная Б. м. ўключае асн. масіў дыялектаў і т. зв. палескую групу гаворак, якія многімі фанет. і грамат. рысамі збліжаюцца з паўн. гаворкамі ўкр. мовы. У асн. масіве вылучаюцца паўн.-ўсх. і паўд-зах. дыялекты, паміж імі знаходзіцца палоса пераходных, ці сярэднебел., гаворак.

Паўн.-ўсх. дыялект ахоплівае паўн.-ўсх. частку Беларусі, яго паўд. мяжа праходзіць прыблізна па лініі Свір — Бягомль — Магілёў — Сураж Бранскай вобл. Паўд.-зах. дыялект займае паўд.-зах. частку бел. моўнай тэрыторыі, паўн. мяжа яго ідзе ніжэй ад лініі Ліда — Мінск — Бабруйск — Рэчыца — Лоеў. Унутры гэтых асн. дыялектаў ёсць асобныя групы гаворак са сваімі фанет. і грамат. асаблівасцямі. Паўн.-ўсх. і паўд.-зах. дыялекты ў галіне фанетыкі проціпастаўляюцца дысімілятыўным і недысімілятыўным аканнем і яканнем («въда», «зімля» і «вада», «зямля»), супадзеннем у гуку «а» або адрозненнем этымалаг. канцавых галосных «о» і «а» («сена», «ліпа» і «сено», «ліпа»), неаднолькавым развіццём былога «Ъ» («лес», «хлеб» і «лёс», «хлёб» ці «ліес», «хліеб») і «о», «е» ў націскных закрытых складах («конь», «печ» і «коњ», «печ» ці «куоњ», «піеч»); наяўнасцю ці адсутнасцю падаўжэння мяккіх зубных і цвёрдых «ж», «ч», «ш» перад стараж. спалучэннем «-ь-» («насенне», «збожжа» і «насенье», «збожье» ці «насене», «збожа»). Асаблівасці ў марфалогіі: ужыванне адна- ці двухскладовага канчатка назоўнікаў і прыметнікаў ж. роду ў творным склоне адз. л. («мяжой», «зялёнай» і «мяжою», «зялёнаю»), канчатка «-ы» ці «-а» ў назоўніках пітяка роду назоўнага склону мн. л. («вокны», «вёдры» і «вокна», «вёдра»), канчатка «-ам» ці «-ом» у давальным склоне мн. л. («нажам», «садам» і «нажом», «садом»), канчатка «-ах» ці «-ох» у месным склоне мн. л. («у садах», «у лясах» і «ў садох», «у лясох»); розныя асновы ў назоўніках, што абазначаюць назвы маладых істот («дзяцёнак», «цялёнак» і «дзіця», «цяля»). Дзеясловы ў гэтых дыялектах адрозніваюцца наяўнасцю ці адсутнасцю канчатка «-ць» у 3-й асобе адз. л. («бярэць», «нясець» і «бярэ», «нясе»), націскным «о» ці «е» ў 2-й асобе мн. л. («берацё», «несяцё» і «бераце», «несяце»), ненаціскным канчаткам «-уць» ці «-аць» у 3-й асобе мн. л. дзеясловаў 2-га спраж. («вучуць», «гаворуць» і «вучаць», «гавораць»). У паўд.-зах. дыялекце пашыраны таксама формы 1-й асобы мн. л. на «-мо» («гледзімо», «седзімо»), канчатак «-еце» ў загадным ладзе 2-й асобы мн. л. («ідзéце», «нясéце») і формы будучага часу на «-ьму», «-іму» («рабіцьму», «хадзіцьму»; «рабіціму», «хадзіціму»). Палоса пераходных, ці сярэд-

небел., гаворак праходзіць з ПнЗ на ПдУ паміж паўн.-ўсх. і паўд.-зах. дыялектамі. Гэтыя гаворкі маюць рысы паўн.-ўсх. і паўд.-зах. дыялектаў, але ў іх ёсць і свае асаблівасці. Тут, напр., ужываюцца дзеясловы 2-га спражэння ў 3-й асобе адз. л. з ненацісным канчаткам «-а(-л)» («гавора», «ходзя»), спарадычныя формы творнага склону мн. л. («вачор», «зыма»), вымаўленне «і» на месцы былога «ѣ» («ліс», «біл») і на месцы «о», «е» у закрытых складах пад націскам («кінь», «піч»), спалучэнне «мн» перад «-а(-л)» («мнята», «мнясо»), канчатак «-ові» ў давальным і месным склонах назоўнікаў м. роду адз. л. («братові», «сынові»), канчатак «-ому» ў прыметніках і займенніках меснага склону («на крутому», «на тому»), шыпячы вычны ў асабовых формах дзеясловаў з асноваў на задненазычны («сечу», «печуть»), вычны «л» у дзеясловах 3-й асобы мн. л. з асноваў на губныя («купляць», «лоўляць») і інфінітывы на «-ці(-ты)» пасля галосных не пад націскам («купыты», «ходыты»). Бел. дыялекты і асобныя гаворкі ўнутры іх адрозніваюцца таксама словаўтварэннем і лексікай.

Б. м., таксама як руская і ўкраінская, пачала складвацца ў 13 ст. ва ўмовах феад. раздробленасці тэрыторыі былой Кіеўскай Русі. Яна ўвабрала ў сябе тыя дыялекты стараж.-рус. мовы, якія развіліся з гаворак былых усх.-слав. плямёнаў — дрыгавічоў, радзімічаў і зах. крывічоў. Пазнейшыя падзеі — нашэсце татара-манголаў на паўн.-ўсх. і паўд.-зах. землі былой Кіеўскай Русі і ўключэнне тэр. Беларусі і Украіны ў склад Вялікага кн. Літоўскага — прывялі да фарміравання ў 14—15 ст. беларускай, рускай і ўкраінскай народнасцей і канчатковай дыферэнцыяцыі адпаведна беларускай, рускай і ўкраінскай моў. Менавіта тады і ўзніклі найважнейшыя фанет., грамат. і лекс. рысы, што надаюць спецыфіку сучаснай Б. м.

У Вял. кн. Літ. Б. м. доўгі час выкарыстоўвалася ў дзярж., дыпламат. і прыватнай перапісцы, у канцылярыях гарадскіх, земскіх і замкавых судоў, у гарадскіх управах, магістратах і магдэбургіях. На Б. м. перакладалі воінскія і рыцарскія аповесці і раманы, гістар. хронікі і апакрыфічныя аповесці, на ёй стваралі маст., публіцыст. і мемуарныя творы, ёю карысталіся ў рэліг.-палемічнай, гамілетычнай і агіяграфічнай л-ры, у настаўленнях для культавых рытуалаў і ў царк. ваканадаўстве. В. м. той пары прыметна вылучалася характарам узаемадзеяння з царк.-слав. мовай, якая ў праваслаўных славян доўгі час выконвала ролю канфесійнай і літ. мовы. Пашырэнне на Беларусі розных рэфармац. плыняў, пры інш. спрыяльных фактарах, садзейнічала пранікненню Б. м. ў сферу канфесійнай л-ры, тым самым абмяжоўвалася выкарыстанне царк.-слав. мовы і не ўплыў на мову бел. пісьменнасці. Заснавальнік бел. кнігадрукавання Ф. Скарына, захаваўшы царк.-слав. аснову біблейскіх тэкстаў, карыстаўся беларускімі словамі ў такой меры, што мова яго кніг значна адышла ад традыцыйнай царк.-слав. мовы праваслаўнага ўжытку. У абмежаванні мовы рэліг. л-ры з жывой народнай гутаркай яшчэ далей пайшлі С. Будны і В. Цяпінскі. У развіцці літ. Б. м. значны ўклад зрабілі Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, Л. Карповіч, А. Філіповіч і інш. Пашырэнне грамадскіх і культ. функцый Б. м. ўдасканальвала яе грамат. структуру і слоўнікавы склад. Значна ўзбагацілі слоўнік запазычанні з тых моў, з якімі Б. м. кантактавалася. Адчувальны пласт у стараб. мове складалі царкоўнаславянізмы, русізмы, цюркізмы і літуанізмы. Асабліва цесна яна была звязана з укр. мовай. Маючы самастойныя жывыя нар. мовы, беларусы і украінцы ў пісьмовым ужытку карысталіся па сутнасці адзінай мовай, у якой бел. грамат. і лексічныя элементы займалі значнае месца. Б. м. ўзаемадзейнічала і з польскай мовай, папаўняючыся яе лексікай, грамат. і словаўтваральнымі сродкамі. Праз польскую мову пранікалі словы з нім., чэш., лац., а пазней з італьян. і франц. моў. У сваю чаргу бел. лексіку запазычвалі суседнія мовы, асабліва літоўская. У польскую пранікалі бел.-ўкр. словы і некат. словаўтваральныя сродкі. Ва ўкр. мове асобныя агульнаслав. словы замацоўваліся ў бел. вымаўленні. Праз Б. м. многія зах.-еўрап. запазычанні прыходзілі ў рус. і ўкр. мовы. Паводле ўмоў Люблінскай уніі (1569) Беларусь, як і астатнія часткі Вял. кн. Літ., была ўключана ў склад Рэчы Паспалітай. У новых паліт. умовах вышэйшы слаі бел. грамадства, чые інтарэсы першапераліся і абслугоўвала пісьмовая Б. м., паланізаваліся і пачалі карыстацца польскай мовай. З 2-й пал. 17 ст. літаратурную Б. м. перасталі ўжываць спачатку ў справаводстве, а потым і ў інш. сферах культ. жыцця; яна бытавала пераважна ў дыялектнай форме.

Вялікае значэнне для развіцця Б. м. мела ўз'яднанне Беларусі з Расіяй. Яно ліквідавала эканам. замкнёнасць бел. зямель, паскорыла пераход ад феад. да капіталіст. адносін і далучыла бел. народ да багатай культуры рус. народа. Уз'яднанне з'явілася важным фактарам у фарміраванні бел. нацыі і нац. мовы. Нац.-вызв. рух і рост нац. самасвядомасці беларусаў прывялі да ўзнікнення новай бел. літ. мовы. Найбольш значную ролю ў яе станаўленні адыгралі пісьменнікі В. Дунін-Марцінкевіч і Ф. Багушэвіч. Развіццю мовы мастацкай л-ры садзейнічалі аўтары ананімных вершаў і гутарак, паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», рэвалюцыянер і асветнік К. Каліноўскі, паэты Я. Лучына, А. Гурыновіч, А. Абуховіч і інш. Новая бел. літ. мова складвалася выключна на базе жывых нар. гаворак, без выкарыстання пісьмова-моўных здабыткаў папярэдніх стагоддзяў, і стала зусім свабоднай ад царкоўнаславянізмаў. Бел. пісьменнікі 19 ст. шырока ўводзілі ў літ. ўжытак грамат. і лексічныя асаблівасці сваіх родных гаворак. Іх творы друкаваліся на лацінцы польскай мадыфікацыі і кірыліцы рус. варыянту. Выкарыстанне двюх графічных сістэм стрымлівала выпрацоўку адзіных арфагр. і грамат. нормаў. Працэс фарміравання літ. мовы праходзіў ва ўмовах сац. і нац. прыгнёту. Царызм забараняў бел. народу карыстацца роднай мовай у дзярж. установах і школьным навучанні. Літ. Б. м. 19 ст. выкарыстоўвалася пераважна ў паэтычных і часткова ў публіцыст. творах, у яе яшчэ не было такіх прыкмет, як унармаванасць, стылістычная дыферэнцыяцыя, агульнаабавязковасць і прыдатнасць для розных мэт зносін.

Новы этап у гісторыі бел. літ. мовы звязаны з рэвалюцыяй 1905—07. Уздым на Беларусі ў пач. 20 ст. рэвалюц. і нац.-вызв. руху суправаджаўся з'яўленнем бел. выдавецтваў і друкаваных перыядычных органаў (гл. *«Загляне сонца і ў наша аконца»*, *«Наша хата»*, *«Сахаў»*, *«Наша доля»*, *«Наша ніва»*, *«Лучынка»*). Літ. мова пашырылася на публіцыстыку, навукова-папулярную л-ру, навучальна-пед. выданні і дзелавыя паперы; выпрацоўваліся асн. правапісныя і грамат. нормы, слоўнікавы склад папоўніўся грамадска-паліт. і інш. навук. тэрмінамі, пачало складвацца літ. вымаўленне. Ва ўзбагачэнні і ўнармаванні літ. мовы вялікую ролю адыгралі пісьменнікі і паэты Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, З. Бядуля, Ц. Гартны і інш.

Бурнае развіццё літ. мовы пачалося пасля Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі, калі бел. народ вызваліўся ад сац. і нац. прыгнёту і атрымаў сав. даяржаўнасць. Выкарыстанне Б. м. ў л-ры і навуцы, у школах, дзярж. і культ.-асветных установах выклікала інтэнсіўную работу над упарадкаваннем арфагр. і грамат. нормаў літ. мовы, распрацоўкай грамадска-паліт. і навук.-тэхн. тэрміналогіі і пармалізацыяй яе слоўнікавага складу. Актыўнаму развіццю бел. літ. мовы садзейнічалі шырокі ўдзел нар. мас у гасп. і культ. жыцці, стварэнне густой сеткі пачатковых, сярэдніх і вышэйшых школ і культ.-асвет. устаноў. Магутным фактарам развіцця літ. мовы, пармалізацыі яе грамат. сістэмы і слоўнікавага складу з'явіліся небывалы дагэтуль уздым друкарства, пашырэнне сродкаў масавай камунікацыі (радыё, тэлебачанне, кіно, тэатр і інш.). Дабратворна ўплывае на Б. м., асабліва на яе слоўнікавы склад, рус. мова, якая стала сродкам міжнацыянальных зносін народаў СССР.

Навуковая распрацоўка Б. м. пачалася ў першыя дзесяцігоддзі 19 ст. Спачатку яе вялі пераважна аматары нар. славеснасці, этнографы і фалькларысты; яны збіралі і публікавалі помнікі нар. творчасці і старабел. пісьменнасці, часам рабілі навуковыя падыходы да іх моўных асаблівасцей (І. І. *Грыгаровіч*, П. М. *Шпілеўскі*, П. В. *Шейн*, М. Я. *Нікіфароўскі*, Е. Р. *Раманаў*). Многія факты Б. м. кваліфікавана аналізавалі рускія мовазнаўцы А. А. *Патэбня*, А. І. *Сабалеўскі* і А. А. *Шахматаў*. У мінулым найб. ўклад у вывучэнне В. м. і яе гісторыі зрабілі І. І. *Насовіч* і Я. Ф. *Карскі*. Але вывучэнне Б. м. ў дарэвалюц. час мала ўзаемадзейнічала з працэсам фарміравання бел. літ. мовы і амаль не ўплывала на яе развіццё. У 1918 у Петраградзе выдадзена «Беларуская граматыка для школ» Б. А. Тарашкевіча. Арганізавана і метанакіравана даследуецца В. м. пры Сав. уладзе. Мовазнаўцы Беларусі падрыхтавалі дыялекталагічны атлас бел. мовы, апісальна-нарматыўную граматыку і даследаванні па гісторыі бел. літ. мовы. Упершыню былі створаны падручнікі бел. мовы для агульнаадук. школы. Вышэйшая школа забяспечана дапаможнікамі па гісторыі мовы, дыялекталогіі і сучаснай літ. мове. Апублікаваны спец. манаграфіі, якія асвятляюць асобныя праблемы фанет. сістэмы і грамат. ладу. Слоўнікавы склад літ. мовы атрымаў лексікаграфічную апрацоўку ў перакладных рус.-бел. і бел.-рус. слоўніках. Рыхтуюцца тлумачальны, дыялектны, гістар. і этымалаг. слоўнікі, вывучаюцца кантакты і ўзаемасувязі Б. м. з мовамі інш. слав. і неслав. народаў на розных этапах іх гістар. развіцця.

Літ.: Карский Е. Ф. Белорусы. Введение в изучению языка и народной словесности, Вильна, 1904; Я г о ж. Белорусы. Язык белорусского народа, в. 1—2/3, М., 1955—56; Я г о ж. Труды по белорусскому и другим славянским языкам, М., 1962; Нарысы па гісторыі беларускай мовы, Мн., 1957 (бібліягр.); Ж у р а ў с к і А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы, т. 1, Мн., 1967; Крамко І. І., Ю р э в і ч А. К. і Я н о в і ч А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы, т. 2, Мн., 1968; Шакун Л. М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы, Мн., 1963; Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак, Мн., 1968; Б у я ў п. А. Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі, Мн., 1928; Нарысы па беларускай дыялекталогіі, Мн., 1964 (бібліягр.); Дыялекталагічны атлас беларускай мовы (ч. 1—2), Мн., 1963; В а й т о в і ч Н. Т. Ненацісныя вакалізм народных гавораў Беларусі, Мн., 1968; Граматыка беларускай мовы, т. 1—2, Мн., 1962—66; Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Марфалогія, Мн., 1957; Сінтаксіс, Мн., 1959; Фанетыка, арфаграфія, лексікалогія, Мн., 1961; Л о м т е в Т. П. Грамматика белорусского языка, М., 1956; Ю р г е л е в і ч П. Я. Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі, Мн., 1961; Б у л ы к а А. М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы, Мн., 1970; П а д л у ж н ы А. І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы, Мн., 1969; Б у л а х а ў М. Г. Прыметнік у беларускай мове, Мн., 1964; Ж ы д о в і ч М. А. Назоўнік у беларускай мове, ч. 1, Мн., 1969; М а ц к е в і ч Ю. Ф. Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове, Мн., 1959; Ш у б а П. П. Прыслоўе ў беларускай мове. Марфалагічны нарыс, Мн., 1962; Я н к о ў с к і Ф. М. Беларуская фразеалогія, Мн., 1968; Я г о ж. Пытанні культуры мовы, Мн., 1961; Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, Мн., 1959; Н о с о в и ч И. И. Словарь белорусского наречия, СПб., 1870; Беларуска-рускі слоўнік, М., 1962; Руска-беларускі слоўнік, М., 1953; К р у к о ў с к і М. І. Рускі лексічны ўплыў на сучасную беларускую літаратурную мову, Мн., 1958; А п і ч э н к а У. В. Беларуска-украінскія пісьмова-моўныя сувязі, Мн., 1969; Беларускае мовазнаўства. Бібліягр. ўказальнік (1825—1965), Мн., 1967.

А. І. Жураўскі. Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ НАВУЧАЛЬНАЯ АКРУГА, навучальна-адміністрацыйнае падраздзяленне ў дарэвалюцыйнай Расіі. Створана 17.1.1829 пасля рэарганізацыі *Віленскай навучальнай акругі*. Падпарадкоўвала спачатку навуч. ўстановы Віцебскай і Магілёўскай губ., з 1831 таксама Мінскай, з 1832 — Гродзенскай, Віленскай губ. і Беластоцкай вобл. Кіравала ўсімі відамі сярэд. навуч. устаноў і кантралявала дзейнасць інш. навуч. устаноў. На тэр. акругі было 6 гімназій, 17 пав. вучылішчаў, 160 пач. школ (прыкладна 12 тыс. навучэнцаў). Працавала 553 настаўнікі. У 1834 адкрыта ў Віцебску першая на Беларусі настаўніцкая семінарыя. У крас. 1833 папячыцелю Б. н. а. падаў прашэнне атрымаць пасаду настаўніка пав. вучылішча В. Р. Бялінскі (напісаў спец. артыкул па методыцы выкладання рус. мовы ў школах Беларусі, рукапіс у Цэнтр. дзярж. гістар. архіве БССР, ф. 3157, с. 43). Просьбу Бялінскага не задаволілі. 2.5.1850 акруга ліквідавана ў сувязі з адпаўленнем Віленскай навуч. акругі, да якой былі аднесены навуч. ўстановы Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губ. Навуч. ўстановы Віцебскай і Магілёўскай губ. былі зноў далучаны да Пецярбургскай навуч. акругі.

У. С. Пасэ. Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА (БНР), марыянетачная дзяржава, абвешчаная 25.3.1918 беларускімі бурж. нацыяналістамі з удзелам эсэраў, меншавікоў і інш. згоднікаў як бурж. рэспубліка ва ўмовах акупацыі Беларусі нямецкімі войскамі. Урад БНР — Рада і Народны сакратарыят — абвясціў аддзяленне Беларусі ад Расіі, адмену Сав. улады і дэкрэтаў СНК Зах. вобласці і фронту, памагаў акупантам. Кіраўнікі БНР разлічвалі толькі на падтрымку знешніх рэакц. сіл, але на розных прычынах не атрымалі прызнання ні ад Германіі, ні ад Польшчы, ні ад краін Антанты. Пасля грамадз. вайны Рада БНР збегла ў акупаваную бурж. Польшчу і ў 1925 абвясціла БНР ліквідаванай.

Літ.: Почанин С. З. В грозовом восемнадцатом, Мн., 1969.

«БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ САМАПОМАЧ» («БНС»), антысавецкая нацыяналістычная арганізацыя, створаная фаш. захопнікамі ў кастр. 1941 з мэтай умацавання акупац. рэжыму, барацьбы з сав. патрыётамі, паняволення бел. народа і грабяжу яго нац. багацця. У «БНС» уваходзілі бел. бурж. нацыяналісты і інш. ворагі бел. народа. Каб прыкрыць здрадніцкі характар «БНС», акупанты абвясцілі яе «дабрачыннай», «народнай» арг-цыяй, якая нібыта ставіць мэту змагацца за «адраджэнне» бел. культуры, памагаць пацярпелым у час вайны. На самай справе кіраўнікі «БНС» і іх мясцовыя органы — акруговыя, раённыя і валасныя аддзелы — памагалі фашыстам вывозіць у Германію насельніцтва, матэрыяльныя і культ. багацці Беларусі, намагаліся ператварыць бел. народ у паслухмяных рабоў.

«БЕЛАРУСКАЯ НІВА», штотыднёвая газета рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку, цэнтральны орган *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ). Выдавалася легальна з ліст. 1925 да сак. 1926 у Вільні на бел. мове. Выйшла 35 нумароў, з іх 3 канфіскаваны. Тыраж 2—3 тыс. экз. Пісала пра цяжкае становішча працоўных Зах. Беларусі, выкрывала рэакц. ўнутраную і знешнюю палітыку ўрада бурж.-памешчыцкай Польшчы, польскіх шавіністычных і бел. бурж.-нацыяналіст. і згодніцкіх партый. У рэд. калегію ўваходзілі В. А. *Тарашкевіч*, С. А. *Рак-Міхайлоўскі*, П. В. *Мятла* (адказны выдавец), Я. С. *Бабровіч* (Сымон; фактычны рэдактар). Пасля забароны «В. п.» органам БСРГ стала газ. *«Беларуская справа»*. *І. П. Хайратовіч.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСЕННАЯ КАМІСІЯ, працавала ў 1923—24 пры Дзяржаўным інстытуце музычнай навукі (Масква). Мэтай яе была гарманізацыя бел. нар. песень, перададзеных Нар. камісарыятам асветы БССР (запісы А. *Грыневіча*, У. *Тэраўскага*, М. *Янчука* і інш.). У камісію ўваходзілі кампазітары М. *Іналітаў-Іванаў* (старшыня), М. Аладаў (гл. *Аладавы*), А. Аленін, А. *Грачанінаў*, А. Нікольскі, Я. *Прохараў*. Апрацаваді для хору і салістаў амаль 250 мелодый. Частка гарманізацый апублікавана ў зб. (1928) і пасобку ў серыі «Беларускія народныя песні» (1929—30). Найб. каштоўныя апрацоўкі Грачанінава (для хору — «Пяла калядa», «Перад Пятром», «Чаму сеяначы», «Пораніўка», «Што раёк», для голасу з фп.— «Завінела пчолачка», «Калыханка»), Аладава (для хору — «Ой, загуду», «Мужык жыта прадае», «На гары жораў круцiўся»), Прохарава (хаванай «Ой, рана на Івана», «Ах ты, ворка мая»).

Публ.: Беларускія народныя песні. Сольныя і харавыя з акампанементам фп. Гарманізаваныя Аладавым М., Аленіным А., Іналітавым-Іванавым М., Прохаравым Я., в. 1, Мн., 1928.

І. І. Зубрыч. Мінск.

«БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА», часопіс для жанчын, выдаваўся ў Мінску з 1924, у 1931—41 выходзіў пад назвай «Работніца і калгасніца Беларусі»; з 1946 называецца *«Работніца і сялянка»*.

БЕЛАРУСКАЯ РАДА (Рада беларускіх арганізацый, з кастр. 1917 Вялікая беларуская рада), арганізацыйны цэнтр беларускай нацыяналістычнай контррэвалюцыі. Утворана ў ліп. 1917 на з'ездзе прадстаўнікоў розных бел. нацыяналіст. партый; блакіравалася з меншавікамі. Пасля Кастр. рэвалюцыі адкрыта выступала супраць Сав. улады. З сак. 1918 дзейнічала пад назвай Рада *Беларускай народнай рэспублікі*.

Літ.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1968; Почанин С. З. В грозовом восемнадцатом, Мн., 1969.

«БЕЛАРУСКАЯ РАДА ДАВЕРУ ПРЫ ГЕНЕРАЛЬНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ БЕЛАРУСІ», антысавецкая арганізацыя, створаная гітлераўцамі ў акупаванай Беларусі ў чэрв. 1943 з мэтай маскіроўкі сваёй грабежніцкай палітыкі. Складалася з бел. бурж. нацыяналістаў. Практычная дзейнасць зводзілася да распрацоўкі прапаноў, як задушыць барацьбу бел. народа і рабаваць яго нац. багацці. У снеж. 1943 ператворана ў *«Беларускую цэнтральную раду»*.

Літ.: Раманоўскі В. П. Саўдзельнікі ў злачынствах, Мн., 1964.


БЕЛАРУСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ (БРА), нелегальная рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя нац.-вызв. характару ў Зах. Беларусі. Выдзелілася з левага крыла партыі беларускіх эсэраў вясной 1922. Налічвала каля 300 чл. Мела ўплыў па бел. інтэлігенцыю і частку сялян. У ЦК БРА ўваходзілі П. *Корчык* (І. К. Лагіновіч), А. У. *Канчэўскі*, Л. І. *Родзевіч* (А. Сталевіч), А. Р. *Капуцкі*. Выдавала газ. *«Наш сцяг»* (з 5.6.1923). БРА стаяла на пазіцыях узброенай барацьбы супраць акупантаў, за вызваленне Зах. Беларусі і ўз'яднанне яе з БССР. На паліт. абліччa арг-цыі вялікі ўплыў рабілі поспехі ў гасп. і культ. развіцці Сав. Беларусі, ленінская нац. палітыка ВКП(б). У практыцы барацьбы БРА пераадольвала дробнабурж. погляды і паступова збліжалася з падпольнымі арг-цыямі Камуніст. рабочай партыі Польшчы (КПРП), а пазней з КПЗБ. Кіраўнікі і чл. БРА распаўсюджвалі сярод насельніцтва нелегальныя камуніст. выданні. Прызнаўшы асн. праграмныя і тактычныя прынцыпы Камуніст. партыі, якія знайшлі сваё выражэнне ў рашэннях II з'езду КПРП, БРА на кравой канферэнцыі 30.12.1923 прыняла рашэнне пра самароспуск і ўступіла ў КПЗБ. У склад ЦК КПЗБ ад БРА кааптаваны Корчык, Канчэўскі, Капуцкі. Прыняцце БРА ў склад КПЗБ зацверджана ЦК КПЗБ і ЦК КПРП.

Літ.: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.), Мн., 1966, с. 71—74; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929 гг.), Мн., 1962, с. 179—181, 584; Кучэўска О. «Наш сцяг» — орган Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, у кн.: Навуковы зборнік, Беласток, 1964.

М. С. Арэхва. Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ГРАМАДА, гл. *Беларуская сацыялістычная грамада*.

БЕЛАРУСКАЯ РЭЗЬ, стыль беларускай мастацкай разьбы па дрэве. Быў пашыраны на Беларусі ў 17 ст. Вызначаўся пышным раслінным арнаментам, у які ўпляталіся стылізаваныя фігуры чалавека, птушак, звяроў.



Іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве. 1683.

Служыў для аздаблення палацавых і культавых інтэр'ераў. Стаў шырока вядомы дзякуючы работам бел. разьбяроў у Маск. дзяржаве 2-й пал. 17 ст. У Палаце разьбярных і сталярскіх спраў Маск. Крамля бел. майстрамі (іх было больш за 20) кіраваў «старац» *Арсеній* з Оршы, а пасля яго смерці (1681) К. *Міхайлаў* са Шклова (гл. *Аружэйная палата*). Майстры працавалі ў Каломенскім (гл. *Каломенскі палац*), Ізмайлаве, Данскім манастыры. Іканастас Смаленскага сабора ў Новадзявочым манастыры, аздоблены Б. р.,— выдатны твор мастацтва 17 ст., над якім працавалі Міхайлаў, С. *Зіноўеў*, Г. *Акулаў* і інш. разьбяры.

І. М. Паньшына. Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (БССР, Беларусь), сацыялістычная дзяржава рабочых і сялян, якая ўваходзіць у склад СССР на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя. Утворана 1.1.1919. Тэрыторыя 207,6 тыс. км². Насельніцтва 9003 тыс. чал. (на 15.1.1970). У БССР 6 абласцей (Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская), 117 раёнаў, 81 горад, 122 пасёлкі гарадскога тыпу. Сталіца Мінск (916 тыс. жыхароў, 1970). Гл. асобны том *Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*.

БЕЛАРУСКАЯ САНАЦЫЯ, іранічная назва групы бел. бурж. нацыяналістаў — *Цэнтральнага саюза культурных і гаспадарчых арганізацый*, створанай у 1930 у Зах. Беларусі. Узначальвалася бурж. нацыяналістамі А. Луцкевічам, Р. Астроўскім, Ф. Акінчыцам і Я. Станкевічам. Арыентавалася на супрацоўніцтва з дыктатарскім урадам Пілсудскага, які ў бурж. Польшчы называлі ўрадам «санацыі» (лац. sanatio аздараўленне).

БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ (БСДП), дробнабурж. нацыяналістычная партыя, якая ўтварылася ў 1918 на тэр. зах. раёнаў Беларусі ў выніку расколу *Беларускай сацыялістычнай грамады* і выхаду з яе дзеячаў меншавіцкага кірунку. Выражала інтарэсы гарадской і сельскай дробнай буржуазіі, апіралася на рэфармісцка-згодніцкую частку працоўных і нацыяналіст. згодніцкія элементы інтэлігенцыі. На чале БСДП стаялі Б. А. *Тарашкевіч*, С. А. *Рак-Міхайлоўскі*, А. *Луцкевіч*, В. Іваноўскі, А. Трэпка і інш.; друкаваны орган — газ. «Беларускі звон» (выд. ў Вільні ў 1921—23, выйшла 60 нумароў). Праграма БСДП уключала бурж.-дэмакр. патрабаванні, якія абгрунтоўваліся паняццямі «справядлівасці», «натуральных правоў чалавека». Выступала за захаванне дробнай сялянскай гаспадаркі, аб'яднанай у кааператывы і гасп. саюзы; прапагандавала думку, што ў буйных памешчыкаў трэба абрэзаць толькі літкі зямлі; нацыяналізацыю прамысловасці адкладвала на няпэўны час. Нац. патрабаванні мелі нацыяналіст. рысы («незалежнай Беларускай дэмакр. рэспублікі, якая б абдымала ўсе землі, заселеныя беларусамі ў большасці») побач з абмежаванымі задачамі развіцця бел. культуры. Да польскага бурж.-памешчыцкага ўрада БСДП, хоць і з ваганнямі, была ў апазіцыі. Прытрымлівалася легальных, пераважна парламенцкіх, формаў барацьбы. На выбарах у польскі сейм (ліст. 1922) блок нацыянальных меншасцей, у стварэнні якога ўдзельнічала і БСДП, атрымаў 28% галасоў. З-за рэфармісцка-згодніцкай палітыкі БСДП хутка пачала траціць уплыў сярод мас і ператварылася ў вузкую паўінтэлігенцкую паліт. групоўку. У 1923 у БСДП узнікае левае крыло на чале з Тарашкевічам і Рак-Міхайлоўскім, якія выйшлі з партыі і з П. П. *Валошыным*, П. В. *Мятлой* і інш. ў пач. 1924 стварылі Беларускую партыю незалежных сацыялістаў. БСДП распалася.

Літ.: Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967. *У. А. Палуян.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РАБОЧАЯ ПАРТЫЯ (БСДРП), арганізацыя бальшавіцкага кірунку, якая існавала ў Петраградзе і Гельсінгфорсе з восені 1917 да крас. 1918. Налічвала 700 чл. Узнікла на аснове некалькіх раённых арг-цый *Беларускай сацыялістычнай грамады* (БСГ) Петраграда, якія складаліся з рабочых і маракоў

Балтыйскага флоту — беларусаў і былі левым крылом БСГ. У выканаўчы к-т увахо-дзілі А. Р. *Чарвякоў*, А. Х. Усціловіч (Усці-новіч) і інш. Мела прадстаўніка ў Пецяр-гофскім раённым Савеце Петраграда. Удзель-нічала ў мабілізацыі рабочых Петраграда, маракоў Балт. флоту і салдатаў Петраград-скага гарнізона — беларусаў на ўзброенае паўстанне ў кастр. 1917. Пасля перамогі Кастрычніка БСДРП вяла арганізацыйную і культ.-асвет. работу сярод беларусаў-бежанцаў у Петраградзе і яго ваколіцах; мела шко-лу падрыхтоўкі парт. кадраў. Паводле ра-шэння к-та БСДРП у снеж. 1917 перавыбрана кіраўніцтва Беларускага т-ва ў Петраградзе па арганізацыі дапамогі пацярпелым ад вай-ны (Беларускі бежанскі к-т). У бежанскі к-т увайшлі чл. БСДРП Чарвякоў, І. В. Лагун, Усціловіч. БСДРП імкнулася праз бежанскі к-т ахапіць сваім уплывам усіх бежанцаў-беларусаў. У студз. 1918 Наркамнац РСФСР прыцягнуў БСДРП да стварэння *Беларускага нацыянальнага камісарыята* (Белнацкома). На нарадзе выканкома БСДРП выбрана дэ-легацыя для перагавораў з Наркамнацам пра ўтварэнне Белнацкома, камісарам яго прыз-начаны Чарвякоў. З пачаткам паступлення ням. войск многія чл. БСДРП пайшлі ў Чырв. гвардыю. Разам з ваен. аддзелам Белнацкома з беларусаў створаны атрад Чырв. гвардыі, які ўвайшоў у Камуністычны атрад Петра-градскага к-та РКП(б). Камуністычным атра-дам Петраградскага к-та РКП(б) у складзе 300 чал. камандаваў Усціловіч. Выканаўчы к-т БСДРП пры садзеянні Пецяргофскага Савета арганізаваў кулямётныя курсы. У крас. 1918 на аснове БСДРП створана бе-ларуская секцыя РКП(б) пры Пецяргофскім райкоме РКП(б) — першая з *беларускіх сек-цый РКП(б)*. Яе прадстаўніком у Пецяргоф-скім райкоме РКП(б) быў Лагун.

Я. І. Вараноўскі, М. С. Сташкевіч. Мінск; *В. У. Скалабан.* Ленінград.

БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ГРА-МАДА (БСГ), дробнабуржуазная нацыяналь-ная партыя леванароднцкага кірунку. Утво-рана ў 1902 на базе культ.-асветніцкіх гурт-коў моладзі Вільні, Гродна, Мінска пад наз-вай Беларуская рэвалюцыйная грамада (БРГ). Назву БСГ прыняла на 1-м з'ездзе (снеж. 1903, Вільня). Стваральнікі А. *Луцке-віч*, І. *Луцкевіч*, К. Кастравіцкі (К. *Каганец*), В. Іваноўскі, В. *Ластоўскі*, Ф. Стацкевіч, А. Уласаў, Ф. Умястоўскі, А. Пашкевіч *(Цёт-ка)*, А. *Бурбіс* і інш. Праграма БСГ, прыня-тая на 1-м з'ездзе, змяшчала асн. бурж.-дэ-макр. патрабаванні, у т. л. краявой аўтаноміі для Беларусі ў складзе Расійскай федэратыў-най рэспублікі. Выбарнасць чыноўнікаў, пра-грэс. падатак, ураўнаяльнае землекарыстанне разам са «скасаваннем права асабістай зя-мельнай уласнасці» і пашырэннем ідэі «ўсе-старонняга сябравання і таварыстваў» БСГ выдавала за шлях да сацыялізма. Гэтым па-шырала шкодныя ілюзіі сярод працоўных. На 2-м з'ездзе (студз. 1906) БСГ прыняла меншавіцкую праграму муніцыпалізацыі зям-лі, падтрымлівала сталыпінскую аграрную ра-форму. Чл. БСГ не разумелі гістар. ролі ра-бочага класа, не прызнавалі яго гегемоніі ў рэвалюцыі, распаўсюджвалі дробнабурж. згодніцкія і нацыяналіст. погляды. Патра-ванне культ.-нац. аўтаноміі для нац. мен-шасцей было рэакцыйным, бурж.-нацыяналі-стычным. Як дробнабурж. нац. партыя БСГ у час рэвалюцыі 1905—07 хісталася паміж рэ-валюц.-дэмакр. і ліберальна-бурж. пазіцыямі. На хвалі рэвалюц. ўздыму яна вырасла коль-касна, стварыла некалькі новых арг-цый, абласныя к-ты (1-ы краёвы, Мінск, 2-і краё-вы, Вільня), ЦК у складзе Луцкевіча, Бур-біса, Іваноўскага. Большасць яе кіраўнікоў стаяла на дробнабурж.-згодніцкіх нацыяна-ліст. пазіцыях, заклікала падтрымліваць «ва-боды», дараваныя царскім маніфестам 17 ка-стрычніка. Частка нізавога актыву БСГ, а таксама Пашкевіч, Бурбіс і інш. належалі да рэвалюц.-дэмакр. крыла бел. нац. руху. У перыяд найб. абвастрэння класавай бараць-бы БСГ выдавала пракламацыі, газ. *«Наша доля»*, удзельнічала разам з эсэрамі ў ства-рэнні арг-цый Сялянскага саюза. У канцы 1906 БСГ яўна павярнула ўправа і ў 2-й пал. 1907 як партыя распалася. Рэшткі БСГ згур-таваліся вакол газ. *«Наша ніва»*. Аднавіла дзейнасць пасля Лют. рэвалюцыі і да сярэ-дзіны 1917 налічвала каля 5 тыс. чл. і спа-чуваючых. Апрача Беларусі, арг-цыі БСГ існавалі ў Петраградзе, Маскве, Кіеве, Сара-таве, Казані, Тамбове, Калузе, Адэсе, Гель-сінгфорсе. Яна стаяла на рэфарм.-згодніцкіх і нацыяналіст. пазіцыях, падтрымлівала Ча-совы ўрад, была асн. апорай Беларускага нац. камітэта і Беларускай рады. БСГ узна-чальвалі В. Адамовіч, П. Бадунова, І. Варонка, Я. *Дыла*, З. Жылуновіч (Цішка *Гартны*), Г. Мамонька, М. Муха, А. Прушынскі (Алесь *Гарун*), С. *Рак-Міхайлоўскі*, А. Смоліч, Б. *Та-рашкевіч*, М. Шыла. У чэрв. 1917 БСГ пры-няла новую праграму. Побач са згодніцкімі лозунгамі падзелу зямлі паміж сялянамі праз органы самакіравання і рэакц. бурж.-нацыяналіст. патрабаваннем культурна-нац. аўтаноміі для ўсіх нацый яна змяшчала бурж.-дэмакр. патрабаванні. Правыя нацыя-наліст. элементы пасля Кастр. рэвалюцыі адкрыта пайшлі на шляху контррэвалюцыі і барацьбы супраць Сав. улады, імкнуліся захаваць на Беларусі капіталіст. лад і ства-рыць бурж.-дэмакр. рэспубліку, схаўрусa-валіся з ням. акупантамі і прынялі ўдзел у абвяшчэнні т. зв. *Беларускай народнай рэспублікі* (БНР). У выніку антынароднай дзейнасці правае крыло БСГ страціла рэшт-кі ўплыву на масы і ў сярэдзіне 1918 распалася на *Беларускую сацыял-дэмакра-тычную партыю* і Партыю бел. сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У вер. 1917 значная частка левага крыла БСГ на чале з А. *Чарвяковым*, якая стала на рэвалюц. пазіцыі, выйшла з петраградскай арг-цыі БСГ, стварыла *Бела-рускую сацыял-дэмакратычную рабочую пар-тыю* і далучылася да бальшавікоў. У кастр. 1917 другая частка левага крыла БСГ на ча-ле з Жылуновічам таксама выступіла за пад-трымку Сав. улады, рашуча асудзіла здрад-нікаў з БНР. Больш паслядоўныя чл. левага крыла БСГ уступілі ў партыю бальшавікоў і гэтым паскорылі ўтварэнне *беларускіх сек-цый РКП(б)*, якія ў 1918 групаваліся вакол *Беларускага нацыянальнага камісарыята*. Прадстаўнікі гэтага крыла — Жылуновіч, Чарвякоў, Дыла, Чарнушэвіч, Шантыр — увайшлі ў склад першага ўрада БССР.

Літ.: Ленін У. І. Крызіс меншавізму, Тв., т. 11 (Полн. собр. соч., т. 14); Яго ж. Заключнае слова па дакладу аб адносінах да буржуазных партый 14(27) мая [V з'езд РСДРП. 30 красавік — 19 мая (13 мая — 1 чэрвеня) 1907 г.], Тв., т. 12 (Полн. собр. соч., т. 15); Яго ж. Да гісто-рыі нацыянальнай праграмы ў Аўстрыі і ў Расіі, Тв., т. 20 (Полн. собр. соч., т. 24); Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, 2 изд., Мн., 1968; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962; Палуян У. А. Беларус-кая сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967; Кар-нейчык Я. Беларуская нацыя, Мн., 1969; Ту-рук Ф. Белорусское движение, М., 1921; Крута-левіч В. А. Без народнай апоры, «Полымя», 1967, № 2; Біч М. У змаганні за лепшую долю, «Полымя», 1966, № 8.

М. В. Біч, У. А. Палуян. Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ, заснавана 15(27).8.1840 у маёнтку Горы-Горкі (каля Горак) Магілёўскай губ. Спачатку наз. Горы-Горацкай земляробчай школай. Мела два разрады: вышэйшы, які рыхтаваў спецыялістаў высокай кваліфіка-цыі (навучанне 3 гады), і ніжэйшы, які рых-таваў аграномаў у памешчыцкія маёнткі (навучанне 2—3 гады). У 1842 вышэйшы раз-рад вылучаны ў самастойную навуч. ўстано-ву для падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэй-шай аграномічнай адукацыяй, у 1848 пера-твораны ў Горы-Горацкі земляробчы ін-т (курс навучання 4 гады). Першая ў Расіі вышэйшая агранамічная ўстанова. У ін-це працавалі вядомыя рус. вучоныя А. В. *Саве-таў* і І. А. *Сцебут* (яго выпускнікі). Сцебут упершыню ў гісторыі айч. агранамічнай на-вукі стварыў пры ін-це доследныя ўчасткі («сцебутаўскія» доследныя палі). За ўдзел студэнтаў у паўстанні 1863—64 ін-т быў за-крыты, а ў 1864 пераведзены ў Пецярбург (існаваў як Пецярбургскі земляробчы ін-т). У 1877 яго аб'ядналі з Пецярбургскім ляс-ным ін-там. За 1840—63 ін-т падрыхтаваў 569 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Ся-род іх праф. Пецярбургскага лясного ін-та А. М. Бажанаў, прафесары Пятроўскай зем-ляробчай і лясной акадэміі А. П. Людагоўскі і І. М. Чарпапятаў. У Горках аставаліся: земляробчая школа і камерніцка-таксатар-скія класы (засн. 1858, з 1909 6-гадовае ка-морніцка-агранамічнае вучылішча). На базе гэтых с.-г. навуч. устаноў 7.4.1919 быў адноў-лены Горы-Горацкі земляробчы ін-т. Факуль-тэты: агранамічны, меліярацыйны, лясны, с.-г. машынаэнаўства. У 1920 пры ін-це засн. раённая с.-г. доследная станцыя, у 1921 — Зах. доследна-меліярацыйная арг-цыя. У 1925 да ін-та далучаны Беларускі інстытут сель-скай і лясной гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі (засн. ў Мінску ў 1922) і створана Бел. с.-г. акадэмія імя Кастрычніцкай рэва-люцыі. Факультэты: агранамічны (аддзяле-ні: раслінаводчае, жывёлагадоўлі, эканамічнае), землеўпарадкавальны, лясны, меліяра-цыйны. У 1930 на базе лясного ф-та створа-ны ў Гомелі Бел. лесатэхнічны ін-т (гл. *Бе-ларускі тэхналагічны інстытут*). У 1931 ака-дэмія падзелена на 10 галіновых ін-таў, 4 з іх пераведзены ў інш. гарады рэспублікі. З 1933 усе горацкія ін-ты зноў аб'яднаны ў адну ВНУ — Бел. с.-г. ін-т (у Горках). У 1940 ін-т узнагароджаны ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Гітлераўскія акупанты разбурылі на-вучальныя і інш. карпусы, знішчылі абста-ляванне, бібліятэчны фонд. У 1945 ін-т аднавіў сваю дзейнасць. У 1948 перайменаваны ў Б. с. а. Факультэты ў 1969/70 навуч. г.: агрохі-міі і глебазнаўства; агранамічны (аддзяленні селекцыі і насенняводства, лугаводства, садаагародніцтва); заатэхнічны (аддзяленне птушкагадоўлі); землеўпарадкавальны; ме-ханізацыі с. гасп.; гідрамеліярацыйны; меха-нізацыі гідрамеліярацыйных работ; эканамічны; бухгалтарскага ўліку ў с. гасп. Працуе ф-т павышэння кваліфікацыі (аддзяленні пад-рыхтоўкі кіруючых кадраў с. гасп., перапад-рыхтоўкі спецыялістаў с. гасп.). Акадэмія мае н.-д. лабараторыі, б-ку (каля 750 тыс. та-моў), выдавецтва, музей гісторыі акадэміі, батанічны і дэндралагічны сады, калекцыйны пладовы сад, селекцыйнае доследнае і до-следнае палі, дзярж. племянную станцыю і інш. Створана буйная механізаваная н.-д. гаспадарка (каля 10 тыс. *га* зямлі, жывёла-гадоўчыя фермы). Навучанне дзённае і за-вочнае, аспірантура з 1921. У 1969/70 навуч. г. ў акадэміі займалася 10 407 студэнтаў.

У савецкі час у Б. с. а. працавалі вядомыя вучоныя: Я. К. Аляксееў, М. І. Бурштэйн, І. П. Васількоў, Ю. А. Вейс, У. У. Вінер, М. М. Гайдукоў, Ц. М. Годнеў, А. Д. Дубах, А. І. Кайгарадаў, А. К. Кедраў-Зіхман, А. В. Ключароў, І. І. Красікаў, Ф. В. Лунгергаўзен, І. С. Лупіноўскі, Б. А. Мажароўскі, Р. П. Спара, П. А. Хадаровіч, Л. І. Яшноў і інш. У розны час акадэмію ўзначальвалі рэктары У. І. Кіркор (1919—24), М. Ц. Козыраў, П. В. Саевіч, П. І. Пін-чук, М. М. Каўцовіч, В. І. Шэмпель, І. Ф. Гарку-ша і інш. За гады існавання акадэміі падрых-тавала каля 20 тыс. спецыялістаў. Сярод яе выха-ванцаў акадэмікі АН БССР П. І. Альсмік, А. С. Вечар, М. А. Дарожкін, А. Р. Мядзведзеў, С. Г. Скарапанаў, чл.-кар. АН БССР С. Н. Іваноў і інш. У 1970 на 57 кафедрах 495 навук. работ-нікаў, у т. л. 13 прафесараў і дактароў навук, 166 дацэнтаў і канд. навук. Прафесары і д-ры навук: А. М. Брагін, Р. Т. Вільдфлуш, І. Ш. Гар-фінкель, Я. М. Жураўлёў, С. С. Захараў, Ф. К. Ку-рапаценка, Ф. І. Лішчанка, М. Я. Мацапура, А. І. Новік, А. І. Рудакоў, М. С. Савіцкі, К. А. Шуін. Рэктар (з 1964) чл.-кар. УАСГНІЛ праф. К. М. Сонцаў.

Асн. праблематыка даследаванняў: павы-шэнне інтэнсіфікацыі с.-г. вытворчасці Бела-русі. Вучоныя Б. с. а. падтрымліваюць цес-ную сувязь з калгасамі і саўгасамі, нама-гаюць ім укараніць навук. дасягненні і пе-радавы вопыт у с.-г. вытворчасць. Акадэмія мае права прымаць да абароны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па с.-г. і тэхн. на-вуках. Акадэмія выдае «Працы» (з 1935; у 1852—57 «Записки Горы-Горецкого земледель-ческого института»; у 20—30-я г. 20 ст. назва мянялася: «Запіскі...», «Працы...»), падручнікі,

навуч. дапаможнікі. Выпускае шматтыражную газ. «Советский студент». Ід. гл. на ўкл.

Літ.: Цитович С. Г. Горы-Горецкий земледельческий институт — первая в России высшая сельскохозяйственная школа, Горки, 1960; Новиков Д. Р. Белорусская сельскохозяйственная академия, Мн., 1965; Белорусская ордена Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия. Очерки истории, Мн., 1965.

К. М. Сонцаў. Горкі Магілёўскай вобл.

«БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА», прагрэс. газета, орган рэвалюц.-дэмакратычнай і нац.-вызв. арг-цыі працоўных Зах. Беларусі *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ) пасля забароны ўладамі бурж. Польшчы газ. *«Беларуская ніва»*. Была разлічана на членаў БСРГ, рабочых і сялян Зах. Беларусі. Выдавалася з 9.4 да 31.7.1926 у Вільні на бел. мове 2 разы на тыдзень. Выйшла 29 нумароў, 7 з іх канфіскаваны ўладамі бурж. Польшчы. Тыраж да 8 тыс. экз. Прапагандавала праграму і тактычныя лозунгі БСРГ, змагалася супраць польскіх памешчыцкіх і бел. бурж.-нацыяналіст. партый і груповак, крытыкавала нац. і эканам. палітыку ўрада бурж. Польшчы, пісала пра дзейнасць Т-ва бел. школы і жыццё працоўных БССР. Выдавец П. *Мятла*, рэдактары А. Вільчыцкі (№ 1—21), С. Макулік (№ 22—29). *С. В. Говін.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ СТУДЫЯ пры цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе, створана ў 1933. Маст. кіраўнік Б. Жукоўскі. Падрыхтавала спектаклі: «Глыбокая правінцыя» М. Святлова, «Не было ні гроша, ды раптам шастак» А. Астроўскага, «Варвары» М. Горкага і «Банкір» А. Карнейчука. У 1937 студыю скончыла 19 чал., у т. л. С. Болітар, П. Бондараў, Ю. Гальперына, У. Говар-Бандарэнка, С. Гурвіч, А. Дашкоўскі, В. Ігнацьеў, З. Курдзянок, Б. Левін, Н. Навіцкі, В. Сівіцкі, М. Фрадкін, Л. Фрыдман, Л. Цімафеева, В. Чамялоў, якія склалі ядро трупы *Беларускага тэатра юнага гледача.*

БЕЛАРУСКАЯ СТУДЫЯ ОПЕРЫ І БАЛЕТА, арганізавана ў 1930 на базе опернага класа Бел. муз. тэхнікума. У 1933 ператворана ў *Беларускі тэатр оперы і балета.*

БЕЛАРУСКАЯ СЯЛЯНСКА-РАБОЧАЯ ГРАМАДА (БСРГ), масавая легальная рэвалюц.-дэмакр. арг-цыя ў Зах. Беларусі ў 1925—27. Праграма БСРГ (прынята 12.5.1926) змяшчала асн. дэмакр. і асобныя сацыяліст. патрабаванні: самавызначэнне Зах. Беларусі, аб'яднанне ўсіх бел. зямель у рэспубліцы сялян і рабочых, што азначала ўз'яднанне з БССР; сялянска-рабочы ўрад; дэмакр. свабоды; канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных зямель, пераход іх ва ўласнасць дзяржавы і падзел паміж малазямельнымі сялянамі і парабкамі; ліквідацыя асадніцтва; пераладжэнне падаткаў на заможныя класы; 8-гадзінны рабочы дзень, удзел рабочых у кантролі за вытворчасцю; нац. роўнасць і навучанне на роднай мове; свабода сумлення, аддзяленне царквы ад дзяржавы і інш. Гал. сродкам сац. і нац. вызвалення працоўных БСРГ лічыла адкрытую барацьбу з эксплуататарамі на аснове саюзу рабочага класа і працоўнага сялянства. Грамада арганізоўвала паліт. мітынгі, сходы, дэманстрацыі; выступленні сяляп супраць памешчыкаў, кулакоў, асаднікаў, падатковага прыгнёту і аграрнай палітыкі ўрада; за вызваленне палітзняволеных, за стварэнне бел. школ, і інш.

Дзейнасць Грамады ўзначальваў Цэнтр. Камітэт. Старшыня ЦК Б. А. *Тарашкевіч*, нам. старшыні С. А. *Рак-Міхайлоўскі*, чл. П. П. *Валошын* і П. В. *Мятла*; кіраўнік Цэнтр. сакратарыята М. В. *Бурсевіч*, нам. сакратара В. Макоўскі, паліт. рэдактар газет Я. С. *Бабровіч*. БСРГ змагалася супраць польскіх і бел. бурж.-нацыяналіст. і згодніцкіх партый; супрацоўнічала з рэвалюц.-дэмакр. партыяй польскіх сялян ЦІХ, укр. арг-цыяй «Сельроб»; вяла культ.-асветную работу.

24.7.1925 дэпутаты польскага сейма Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын і Мятла выйшлі з бел. нац. фракцыі сейма (гл. *Беларускі пасольскі клуб*) і стварылі пасольскі клуб БСРГ. Карыстаючыся дэпутацкай недатыкальнасцю, чл. клуба БСРГ разгарнулі работу па стварэнні арг-цыі працоўных для барацьбы супраць сац. і нац. прыгнёту. Яны актыўна скарыстоўвалі трыбуну сейма. Вялікую дапамогу ў стварэнні БСРГ аказвала КПЗБ. З дапамогай БСРГ Кампартыя накіроўвала рэвалюц.-вызв. рух працоўных Зах. Беларусі. Нягледзячы на перашкоды і рэпрэсіі ўлад, Грамада вырасла ў масавую нац.-вызв. арг-цыю бяднейшых і сярэдніх сялян, а таксама рабочых, прагрэсіўнай інтэлігенцыі. У студз. 1927 больш за 2 тыс. гурткоў БСРГ аб'ядноўвалі каля 120 тыс. чл.; дзейнічала 18 павятовых к-таў БСРГ: Баранавіцкі, Беластоцкі, Бельскі, Валожынскі, Ваўкавыскі, Вілейскі, Віленскі, Гродзенскі, Дзісенскі, Косаўскі, Лідскі, Маладзечанскі, Навагрудскі, Пастаўскі, Шпскі, Сакольскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі. ЦК Грамады выдаваў газеты, якія з-за праследаванняў улад часта закрываліся: *«Жыццё беларуса»*, *«Беларуская ніва»*, *«Беларуская справа»*, *«Народная справа»*, *«Наша справа»*, *«Наш голас»*, *«Наша воля»*, *«Народны звон»*, час. *«Маланка»*. У БСРГ актыўна ўдзельнічалі: А. П. Антановіч, Я. М. Баліцкі, А. Валь, П. М. Беламызы, В. Герман, У. Ф. Гмыр, К. В. Гоцка, А. Грась, М. А. Ефімовіч, А. С. Зданюк, П. І. Іголка, М. Козіч, М. П. Колпак, І. У. Кот, В. М. Крупіца, І. А. Кузьміч, К. Куптэль, К. С. Лабунька, І. А. Мармыш, І. Мартынеўскі, А. Ф. Марчык, М. А. *Машара*, А. М. Міскевіч, М. І. Нікіфароўскі, І. Падражанец, І. К. Патапчук, А. В. Патоцкі, П. С. *Пестрак*, С. Пісарэвіч, С. П. Саванец, А. А. Сакалоўскі, А. *Салагуб*, В. А. Салыга, В. Сідаровіч, С. С. Стоцік, С. Татарын, У. С. Харкевіч, А. Цяліца, І. Шацько, В. В. Шкодзіч, В. В. Шушкевіч, С. Шчыглінскі, К. Шымкевіч, М. П. Шэвель, В. Юхнель, М. М. Якімовіч, П. У. Якубчык, С. А. Янкоўскі і інш. 15.1.1927 улады пачалі ліквідацыю гурткоў і камітэтаў БСРГ, масавыя арышты ле актывістаў. 21.3.1927 Грамада афіцыйна забаронена. Больш за 400 ле кіраўнікоў і актывістаў аддадзены пад суд. У 1927—29 адбыліся судовыя працэсы над чл. Грамады, у т. л. *«працэс 56»*. У абарону БСРГ працоўныя Зах. Беларусі наладжвалі масавыя выступленні (гл. *Косаўскі расстрэл*). Мітынгі ў абарону Грамады праводзілі працоўныя СССР, а таксама Германіі, Чэхаславакіі, Англіі, Аўстрыі, Францыі, Італіі, ЗША, Канады, Бразіліі.

Літ.: Мицкевич-Капсукас В. Национально-революционное движение в Западной Белоруссии и разгром Громады, «Коммунистический интернационал», 1927, № 6; Багдановскі Я. і Бабровіч Л. Аб класавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, Мн., 1932; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929), Мн., 1962; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966, с. 131—159; Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967.

У. А. Палуян. Мінск.


БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАРМОНІЯ (Беларуская дзяржаўная філармонія), арганізавана ў 1937. Першыя творчыя калектывы Б. ф.: сімф. аркестр (гал. дырыжор І. Му-




1



2



3



4

Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.

1. Галоўны корпус.
2. Адзін з навучальных карпусоў.
3. Лабараторныя заняткі студэнтаў заатэхнічнага факультэта.
4. На навучальным палігоне; заняткі па тэхнічным доглядзе сельскагаспадарчых машын.
5. Практычныя заняткі на культурнай пашы.
6. Студэнты эканамічнага факультэта вывучаюць механізацыю ўліку.
7. Студэнты акадэміі на цалінных землях (1958 г.).



5



6




7













Беларускі аўтамабільны завод.

1. Інжынерны корпус.
2. У канструктарскім бюро завода.
3. Галоўны канвеер зборкі аўтамабіляў БелАЗ-540 і БелАЗ-540А.
4. Цэх зваркі кузаваў.
5. Зборка аднавосевага цягача БелАЗ-531.
6. БелАЗ-540 А.

сіп), аркестр нар. інструментаў (дырыжор К. Сімяонаў), харавая капэла (маст. кіраўнік І. Бары), ансамбль бел. нар. песні і танца (маст. кіраўнік І. Любан, хормайстар Н. Сакалоўскі, балетмайстар К. Алексютовіч), вак. і смычковы квартэты. На 1970 у складзе Б. ф.: *Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, Дзяржаўны народны аркестр БССР*, камерны аркестр, канцэртна-эстрадныя і канцэртна-лекцыйныя брыгады, камерны аддзел, гастрольны аддзел, аддзел муз. ансамбляў, вялікая група салістаў і чытальнікаў. Гал. рэжысёр Б. ф. засл. арт. БССР Ю. *Ужанцаў*. Сярод салістаў засл. артысты БССР А. Астрамецкі, В. Бурковіч, В. Вуячыч, Р. Дзідзенка, Г. Мартынаў, М. Табашнікаў-Зорын, М. Шышкін, Е. Эфрон, лаўрэаты міжнар. конкурсаў С. Гулевіч, Р. Нодэль, В. Шацкі, М. Шмелькін. Б. ф. вядзе канцэртную, лекцыйную, муз.-асветную работу, яе творчыя калектывы і салісты гастралююць па Сав. Саюзе і за мяжой. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга (1940). *А. Я. Ракава.* Мінск.

«БЕЛАРУСКАЯ ХАТА», штотыднёвая ілюстраваная газета бурж.-нацыяналістычнага кірунку, якая выходзіла ў Вільні на бел. мове з 7.10 да 19.12.1926. Выдавалася т-вам «Беларуская хатка ў Вільні», арганізаваным кулацкай нацыяналіст. партыяй *Беларускі сялянскі саюз*.

«БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА», клуб беларускай мастацкай інтэлігенцыі, які працаваў у Мінску ў 1917—20. Садзейнічаў стварэнню бел. сав. т-ра. У «Б. х.» працавалі *Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, Таварыства працаўнікоў мастацтва, Драматычная секцыя Беларускай тэатральнай грамады*. Кіраўнікі У. *Фальскі*, У. *Галубок*, Ф. *Ждановіч*.

Літ.: Нефед В. Становление белорусского советского театра, Мн., 1965; Рамановіч Я. Рэкі цякуць з ручаёў, Мн., 1969; Ягож. «Беларуская хатка», у кн.: Горад і годы, Мн., 1967.

БЕЛАРУСКАЯ ХРЫСЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ (БХД), бурж.-нацыяналістычная клерыкальная партыя, якая існавала на тэр. Зах. Беларусі ў 1917—40. Узначальвалі БХД ксяндзы Адам Станкевіч, Гадлеўскі, Стаповіч, Каруза, Пазняк і інш. Цэнтральны орган — газ. *«Беларуская крыніца»*. Сваім уплывам ахоплівала пэўную частку беларусаў-католікаў. Праграма БХД адстойвала асновы бурж. ладу, і ў т. л. прыватную ўласнасць. Аднак пад націскам радавых членаў партыі і для маскіроўкі сваіх сапраўдных мэт выстаўляла і асобныя дэмакр. патрабаванні. Змагалася супраць рэвалюц. і нац.-вызв. руху; выступала за рэстаўрацыю капіталізму ў БССР і адрыў яе ад СССР. З мэтаю пашырэння ўплыву і на праваслаўных беларусаў у студз. 1936 БХД перайменавана ў Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА). Пад уплывам БХД былі частка *Беларускага нацыянальнага камітэта, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры* (БІГіК) і невялікая арг-цыя моладзі (Беларускі студэнцкі саюз), якая выдавала час. «Шлях моладзі» і газ. «Хрысціянская думка».

І. П. Хайратовіч. Мінск.

«БЕЛАРУСКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ РАДА» («БЦР»), марыянетачны «ўрад», утвораны гітлераўцамі ў снежні 1943 на акупаванай Беларусі. Складалася з памагатых фашыстаў з ліку бел. бурж. нацыяналістаў на чале з Р. *Астроўскім*. Чл. «БЦР» памагалі акупантам весці барацьбу з партыз. рухам, наладжваць карныя аперацыі, складалі ім спісы «ненадзейных», намагаліся стварыць з бел. насельніцтва фаш.-нацыяналіст. фарміраванні, т. зв. «Беларускую краёвую абарону», «вербавалі» моладзь у розныя дапаможныя атрады фаш. арміі і на катаржныя работы ў Германію.

БЕЛАРУСКАЯ ЧОРНА-РАБАЯ СВІННЯ, народная група свіней. Выведзена ў Бел. НДІ жывёлагадоўлі (М. М. Замяціп, Д. П. Зубкова, 1968) складаным узнаўленчым скрыжаваннем мясцовых свіней з буйной белай, беркшырскай, буйной чорнай і белай даўгавухай пародамі.




Зацверджана як народная група ў 1968. Тулава доўгае, спіна роўная, шырокая, галава невялікая з увагнутым профілем і невялікімі, крыху звіслымі вушамі. Сярэдняя маса дарослых кныроў каля 300 *кг*, даўж. тулава да 170 *см*, самак адпаведна 230 *кг* і 155 *см*. Вынослівыя, добра прыстасаваныя да прыродных умоў БССР, высокапрадукцыйныя свінні. Плоднасць 10—12 і больш парасят за апарос, з сярэдняй масай 1 парасяці пры нараджэнні 1,2—1,3 *кг*; праз 1 месяц 7—9 *кг*, праз 2 месяцы 16—19 *кг*. Жывая маса 6—7-месячнага падсвінка на адкорме каля 100 *кг*. Скрыжаванне з буйной белай і эстонскай беконнай пародамі дае прыплод, прыгодны на мясны і бекопны адкорм. Б. ч.-р. с. гадуюць пераважна ў Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абл.

Д. П. Зубкова. Жодзіна.

БЕЛАРУСКАЯ ЧЫГУНКА, сетка чыгуначных ліній з комплексам інжынерных збудаванняў, машын і механізмаў, размешчаных на тэр. БССР. Абслугоўвае Бел. эканам. раён і звязвае Паўн.-Зах. і Прыбалтыйскі эканам. раёны з Цэнтральным, Паўд.-Зах. і Данецка-Прыдняпроўскім. Агульная даўж. Б. ч. 5,4 тыс. *км*. Акрамя таго, у рэспубліцы больш за 3,5 тыс. *км* пад'язных шляхоў прамысл. прадпрыемстваў і арг-цый. Густата чыг. сеткі БССР 26 *км* на 1 тыс. *км*^{2}.

Першая чыг. лінія на тэр. Беларусі Парэчча — Гродна і далей да ціперашняй граніцы з Польшчай пабудавана ў снежні 1862 як частка Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. У 19 ст. пабудаваны асн. лініі: Полацк — Вітсбск (1866), Барысаў — Мінск — Негарэлае (1871), Гомель — Мінск (1873), Гомель — Лунінец — Брэст (1882—86). За гады Сав. улады праведзены новыя лініі: Орша — Крычаў і далей на Унечу (1923), Орша — Лепель (1928), Крычаў — Магілёў — Асіповічы (1931) і інш. У 1939—51 БССР абслугоўвалі чыгункі: Заходняя (упраўленне ў Смаленску), Беларуская (упр. ў Гомелі) і Брэст-Літоўская (упр. ў Баранавічах). Да 1946 абслугоўвала ліпію і Беластоцкая (упр. ў Беластоку). У 1951—53 БССР абслугоўвалі Бел. чыгунка (упр. ў Гомелі) і Мінская (упр. ў Мінску), якая ўтварылася ад зліцця




Брэст-Літоўскай чыгункі і Мінскага аддзялення Заходняй чыгункі. У 1953 абедзве чыгункі аб'яднаны ў адзіную Беларускую чыгунку з управленнем у Мінску.

Асн. чыг. лінія, што праходзіць па тэр. БССР,— Масква — Брэст, звязвае СССР з краінамі Еўропы. Найбольш значныя чыг. вузлы: Орша, Мінск, Баранавічы, Брэст, дзе яна перасякаецца з чыг. лініямі Орша — Ленінград, Бахмач — Вільнюс, Вільнюс — Роўна і інш. На поўдні рэспублікі важнае значэнне як чыг. вузел мае Гомель, размешчаны на скрыжаванні чыгунак Бахмач — Вільнюс і Брэнск — Брэст, на поўначы — Полацк. Вялікую ролю ў транзітных і ўнутрырэсп. перавозках адыгрывае Віцебскі вузел па скрыжаванні ліній Орша — Ленінград і Смаленск — Даўгаўпілс. Пасля Айч. вайны адноўлена каля 6 тыс. км чыг. калеі, адбудаваны масты, наладжана сувязь. Даваенная магутнасці чыгунка дасягнула да 1950. У 1966 электрыфікаваны ўчастак Мінск — Маладзечна (для прыгарадных перавозак пасажыраў). У 1969 56% грузаў перавезена цеплавой цягай. Адпраўленне грузаў па Б. ч. за гады Сав. улады выраслa ў параўнанні з 1913 у 10,8 раза, а прыбыццё ў 25 разоў. Увозяцца ў асн. вугаль, металы, буд. матэрыялы, вывозяцца аўтамабілі, трактары, камбайны, нафтапрадукты, мінер. ўгнаенні, драўніна, прадукты с. гасп. і інш. У 1969 адпраўлена па Б. ч. 55,1 млн. пасажыраў — у 2 разы больш, чым у 1940. Транзітныя перавозкі ў грузабароце рэспублікі займаюць больш за 50%. Кіраванне Б. ч. ажыццяўляе Упраўленне Беларускай чыгункі (нач. Я. П. Юшкевіч). Гл. таксама схему да артыкула. *А. Дз. Лялін.* Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ СІСТЭМА, комплекс цеплавых і гідраўлічных эл. станцый рэспублікі, аб'яднаных адзінай сеткай для рацыянальнай вытворчасці, размеркавання і выкарыстання эл. энергіі. Пачатак стварэння — 1930 пасля пуску БелДРЭС. Паралельна працавалі блокстанцыі на ф-цы «Магвалакно» ў Магілёве і папяровай ф-цы «Спартак» у Шклове. У 1940 выпрацоўка эл. энергіі перавысіла ўзровень 1913 у 196 разоў,

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ СІСТЭМА



даўжыня ліній электрапередачы склала: 155 *км* напружаннем 110 *кв*; 112 *км* напружаннем 35 *кв* і болей. У Айч. вайну Б. э. с. разбурана і зноў пачала стварацца ў 1951 пасля ўводу ў эксплуатацыю першага агрэгата на *Смалявіцкай ДРЭС*. У 1954 у энергасістэму ўключаюцца эл. станцыі Мінска, Смалявіцкая ДРЭС (на поўную магутнасць), *Беларуская ДРЭС* (пасля аднаўлення), Магілёўская і Віцебская ЦЭЦ. З уводам у эксплуатацыю (1958) *Васілевіцкай ДРЭС* і аб'яднаннем яе з Гомельскай ЦЭЦ і інш. эл. станцыямі Гомельскай вобл. стварацца паўд. энергасістэма рэспублікі, аб'яднаная ў 1959 з цэнтральнай. Стварэнне Б. э. с. закончылася ў асноўным у 1961—63 пасля ўводу ў эксплуатацыю *Бярозаўскай ДРЭС* і Полацкай ЦЭЦ-2. Ліній эл. перадачы Бярозаўская ДРЭС — Баранавічы — Мінск усе энергетычныя раёны рэспублікі (зах., цэнтр., паўн.-ўсх., паўд.) аб'яднаны адной эл. сеткай. З 1963 Б. э. с. звязана з ПНР, з 1965 з аб'яднаннем энергасістэм Паўн. Захаду і Цэнтра СССР (Літва, Латвія, Эстонія, Ленінград, Карэлія, Калінінград) і праз энергасістэму ПНР звязана з міжнар. энергасістэмай «Мір». Эл. сетка ўключае 15 164 *км* ліній электрапередачы напружаннем 35—330 *кв* і 144 200 *км* — напружаннем ніжэй за 35 *кв*. Найважнейшыя: Лукомльская ДРЭС — Магілёў, Лукомльская ДРЭС — Мінск, Бярозаўская ДРЭС — Баранавічы — Мінск, Бярозаўская ДРЭС — Салігорск, Васілевіцкая ДРЭС — Гомель і інш. Найбольшыя эл. станцыі: цеплавыя кандэнсацыйныя — Лукомльская (гл. адпаведны арт.), Бярозаўская, Васілевіцкая, Смалявіцкая; ЦЭЦ — Мінская № 3, Магілёўская № 2, Полацкая № 2, Віцебская; гідраўлічныя — Асіповіцкая, Чыгірынская. У 1969 выпрацоўка эл. энергіі больш як у 25 разоў перавысіла ўзровень 1940 (гл. табл.).

Магутнасць электрастанцый і выпрацоўка электраэнергіі ў БССР

	1940	1950	1960	1965	1969
Магутнасць, тыс. *кват*	128,8	238,9	990,8	2107,0	2639,8
Выпрацоўка электраэнергіі, млрд. *кват·гадз*	0,51	0,75	3,64	8,41	12,9

Кіраўніцтва Б. э. с. ажыццяўляецца Гал. упраўленнем энергетыкі і электрыфікацыі пры Савеце Міністраў БССР. Гл. таксама схему да арт.

Літ.: Энергетика Белоруссии, Мн., 1968; Ботвинник Я. По ленинскому плану, Мн., 1967.
З. І. Клябанаў. Мінск.

БЕЛАРУСКІ АБЛАСНЫ КАМІТЭТ пры Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце сялянскіх дэпутатаў, утвораны ў ліст. 1917 у Петраградзе. Кіруючы орган В. а. к.— бюро (старшыня Я. С. Канчар). Камітэт не меў аднароднасці ў парт. і арганізацыйным складзе, быў адарваны ад бел. народа і яго патрэб. З-за раскольніцкай дзейнасці эсэраў, незалежнікаў, апартуністаў, анархістаў, якія ўваходзілі ў склад В. а. к., ён распаўся (1918).

Літ.: Круталевіч В. Без народнай апоры. «Полымя», 1967, № 2.
В. А. Дарогін. Мінск.

БЕЛАРУСКІ АЛФАВІТ, сукупнасць знакаў (літар), прынятых у беларускай пісьмовай мове і размешчаных у пэўным парадку. У аснове Б. а., як і ў некат. іншых славянскіх, ляжыць *кірыліца*. Стараж. бел. графіка захоўвала амаль усе літары кірыліцы. Адпаведна бел. глебе ў складзе графем адбыліся некат. змены: выпалі літары Ѧ і Ѥ, радзей сталі ўжываць Ꙗ ѱ, ѳ s. З'явіліся літары «э» (канец 15 ст.), «й» (канец 16 ст.). Бел. першадрукар і асветнік Ф. Скарына на базе кірыліцы стварыў выразнага малюнка шрыфт, які паслужыў узорам для іншых усх.-слав. друкароў. З канца 17 ст., калі польскі сейм афіцыйна забараніў (1697) ужываць бел. мову, на тэр. Беларусі пачалі выкарыстоўваць лац. графіку, хоць і кірыліца ўсё яшчэ існавала. У 19—20 ст. лацінкай друкаваліся некат. ананімныя творы, творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, «Мужыцкая праўда» К. Каліноўскага. У 19 ст. карысталіся і рус. грамадзянскім шрыфтам. Выданні, надрукаваныя гэтым шрыфтам, па традыцыі перадавалі асаблівасці рус. арфаграфіі і слаба адлюстроўвалі такія фанет. рысы бел. мовы, як аканне, дзеканне і цеканне, «ў», зацвярдзенне шыпячых. Некаторы час у бел. выданнях суіснавалі лац. і грамадзянскі шрыфты. З узнікненнем легальнай бел. прэсы грамадзянскі шрыфт паступова прыстасавалі для перадачы гукавой сістэмы нашай мовы: афрыкаты «дз» (мяккі), «дж» пачалі перадаваць 2 літарамі, гук «ц» (мяккі) — літарай «ц», увялі літары «ё», «і», «ў», дыграф «шч» (замест рус. «щ»), перасталі ўжываць «ъ» на канцы слоў пасля цвёрдых зычных і як раздзяляльны знак. Так графічная сістэма, засн. на кірылаўскім алфавіце, стала асноўнай. Яна захоўваецца ў бел. мове і цяпер. Сучасны Б. а. складаецца з 32 літар: Аа, Бб, Вв, Гг, Дд (Дж, дж, Дз, дз), Ее, Ёё, Жж, Зз, Іі, Йй, Кк, Лл, Мм, Нн, Оо, Пп, Рр, Сс, Тт, Уу, Ўў, Фф, Хх, Цц, Чч, Шш, Ыы, Ьь, Ээ, Юю, Яя. У ім літары «е», «ё», «ю», «я», «і» ў пачатку слова, пасля галосных, а таксама пасля «ў», «ь» і апострафа абазначаюць два гукі: «ехаць» («йэхаць»), «ён» («йон»), «даюць» («дайуць»), «стаяць» («стайаць»), «здароўе» («здароўйэ»), «мільярд» («мільйард»), «сям'я» («сямйа»); «ь» (мяккі знак) не мае гукавога значэння, а паказвае мяккасць папярэдняга зычнага: «ясень», «пянька», «спяваць»; афрыкаты «дз», «дж» на пісьме перадаюцца 2 літарамі: «дзядзька», «дождж ык».

Літ.: Пад агульнай рэдакцыяй Л. П. Падгайскі. Мінск.

«БЕЛАРУСКІ АРХІЎ», зборнік дакументаў у 3 тамах па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі 15—18 ст. Выдадзены гісторыка-археал. камісіяй Інстытута бел. культуры

пад кіраўніцтвам Дз. І. *Даўгяллы*. Уключае царскія, каралеўскія, княжскія граматы і прывілеі гарадам на *магдэбургскае права*, шляхце і духавенству — на зямлю і маёнткі, купцам — на гандаль, на ўтрыманне корчмаў, а таксама ахоўныя граматы, інвентары, статуты цэхаў, запісы сялянскіх павіннасцей, завяшчанні, касп. дагаворы, скаргі, рашэнні судоў і інш. У 1-м т. змешчаны дакументы пра эканоміку, сацыяльнае становішча і класавую барацьбу насельніцтва, пераважна Магілёўшчыны 16—17 ст. У 2-м т.— кніга запісаў № 16 з Літоўскай метрыкі — матэрыял па гісторыі Віцебскай і Полацкай зямлі 15—16 ст. (землекарыстанне і землеўладанне сяляў, шляхты, духавенства, гісторыя Віцебска і Полацка, гандаль, падаткі, стараж. беларускае права і інш.). У 3-м т. («Менскія акты», 1930) — матэрыял пра гісторыю Мінска і Міншчыны ў 1494—1791. Дакументы выдадзены на мовах арыгінала (бел., рус., польскай), ёсць вяскі пра месца хавання.

Публ.: Беларускі архіў, т. 1—3, Мн., 1927—30 (на вокл. т. 3, 1931).
Л. В. Аржаева. Мінск.


БЕЛАРУСКІ АЎТАМАБІЛЬНЫ ЗАВОД, прадпрыемства аўтамабільнай прамысловасці. Размешчаны ў г. Жодзіне Мінскай вобл. Унікальнае прадпр., дзе ўпершыню наладжана серыйная вытворчасць вялікагрузных самазвалаў для работы ў горнарудных кар'ерах і на вялікіх будоўлях. Пабудаваны ў 1958 на базе з-да дарожных і меліярац. машын. Першая прадукцыя — 25-тонныя самазвалы МАЗ-525. У 1965 пачаўся серыйны выпуск 27-тонных самазвалаў БелАЗ-540, у 1967 — 40-тонных самазвалаў БелАЗ-548. У 1968 пачаліся выпрабаванні доследнага ўзору 75-тоннага аўтасамазвала БелАЗ-549. Агульная маса аўтамабіля 123 *т*, магутнасць рухавіка 850 *к. с.* Замест мех. перадачы ўжыта эл. трансмісія з генератара і двух вядучых матор-колаў. Цягавыя эл. рухавікі ўманціраваны ў заднія колы. Кіраванне машынай аблягчаецца гідраўлічнымі ўзмацняльнікамі. На базе БелАЗ-549 у 1969 створаны доследны ўзор 120-тоннага аўтапоезда. Распрацоўваюцца канструкцыі 220-тонных аўтагігантаў. За стварэнне аўтамабіля БелАЗ-540 з-д узнагароджаны дыпломам 1-й ступені ВДНГ СССР, аўтамабілю ў 1967 прысвоены знак якасці. За высокія тэхніка-эканам. і эксплуатацыйныя паказчыкі аўтасамазвал БелАЗ-540 на Лейпцыгскім (1965) і Плоўдзіўскім (1966) кірмашах, а БелАЗ-548 на Лейпцыгскім (1967) і Плоўдзіўскім (1968) адзначаны залатымі медалямі. За паспяховую распрацоўку канструкцый і арганізацыю выпуску новых машын, датэрміновае выкананне сямігадовага плана завод у 1966 узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырв. Сцяга, 36 перадавікоў вытв.— ордэнамі і медалямі, токару-расточніку В. В. *Кулінчыку* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1968 за стварэнне уніфікаваных вялікагрузных аўтамабіляў, а таксама за асваенне іх серыйнай вытворчасці прысуджана Дзярж. прэмія СССР: гал. канструктару канд. тэхн. н. З. Л. Сіроткіну, намеснікам гал. канструктара А. В. Зотаву і Г. І. Цярноўскаму, начальнікам канструктарскіх бюро Л. І. Добрых і Э. І. Іванову, гал. тэхнолагу Д. І. Сыраквашу, нам. гал. тэхнолага С. І. Грыцэнку, дырэктару з-да І. Р. Сідаровічу, гал. інжынеру Я. К. Слабкову, нам. гал. інжынера В. І. Лук'яненку, нач. цэха А. Я. Пітуліну. Пры з-дзе працуюць філіялы Бел. політэхн. ін-та і Мінскага аўтамех. тэхнікума, прафілакторый, піянерскі лагер. Гл. таксама *Аўтамабіль, Аўтамабільная прамысловасць*, іл. на ўклейцы. *В. С. Чэчка.* Жодзіна.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ВАНДРОЎНЫ ТЭАТР, гл. *Беларускі тэатр дзяржаўны драматычны тэатр.*

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ, гістарычны музей Беларусі, які існаваў у Мінску з 20.1.1919 да чэрв. 1941. Да 31.8.1923 абласны музей. Размяшчаўся ў будынку б. архірэйскага дома (з 1965 Дом мастацтваў). У аснове калекцый музея былі ўцалелыя пасля грамадз. вайны матэрыялы дарэвалюц. мінскіх музеяў: Царк.-археалагічнага і Т-ва аматараў прыроды і археалогіі.

5 аддзелаў: гісторыка-археал., нумізматычна-сфрагістычны, этнаграфічны, мастацкі, царк.-археал. Пры музеі быў архіў рукапісных дакументаў 16—18 ст. і навук. б-ка. Папаўняўся пераважна матэрыяламі археал. раскопак, этнагр. экспедыцый і экспанатамі, перададзенымі музеямі Масквы, Ленінграда і інш. У 1941 у музеі было больш за 60 тыс. экспанатаў. Найб. каштоўнасць мелі рукапісныя і друкаваныя кнігі 15—18 ст. (Тураўскія чацці-мінеі 1525, Слуцкае евангелле 1580 кн. Юрыя Алелькавіча, друкаваная каляровая Трыёдзь 1494, Слоўнік П. Вярынды), дарчыя граматы 16—17 ст. (на пергаменце з віслымі пячаткамі), грашовыя скарбы 10—18 ст., абразы бел. іканапісных школ 15—19 ст., карціны бел. мастакоў, бел. нац. вопратка, прадметы працы і хатняга ўжытку, вырабы цэхавых майстроў 19 ст., *слуцкія паясы* і розныя ўзоры бел. прыкладнога мастацтва 19—20 ст., ключы ад варотаў Бабруйскай крэпасці, шабля напалеонаўскага маршала Нея. У 1940—41 музей папоўніўся калекцыямі артыл. гармат, рыцарскіх даспехаў 16 ст. і стараж. агнястрэльнай і халоднай зброі з Нясвіжскага замка ням. акупанты. Большасць калекцый загінула. Нязначную колькасць экспанатаў выратавалі ад знішчэння сав. войскі ва Усх. Прусіі і прывезлі ў Мінск. Яны знаходзяцца ў *Дзяржаўным музеі Беларускай ССР*.

Літ.: Белорусский государственный музей, у 1. Мн., 1928; Харкін.: Белорусская культура, сб. 1. Мн., 1928; Хапламповіч П. Справаздача Беларускага дзяржаўнага музея, «Асвета», 1925, № 3.
Л. Дз. Клок. Мінск.



БелАЗ-549В. Доследны ўзор.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (Мінск), найбольш поўнае на Беларусі сховішча рэчавых рэліквій і дакумент. матэрыялаў перыяду Айч. вайны 1941—45. Засн. палаў перыяду Айч. вайны 1941—45. Засн. па-водле рашэння ЦК КП(б)Б ад 30.9.1943, адкрыты для наведвальнікаў 7.11.1944. У фондах і 30 экспазіцыйных залах (пл. 3856 $м^2$) каля 80 тыс. экспанатаў. Экспазіцыя адлюстроўвае кіруючую ролю Камуніст. партыі ў арганізацыі перамогі над фашызмам, асн. аперацыі Сав. Арміі і падзеі на франтах, дзейнасць



Будынак Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

падпольных парт. і камсамольскіх арг-цый у тыле ворага, усенародны характар партыз. руху на Беларусі, удзел прадстаўнікоў братніх народаў і антыфашыстаў замежнага падданства ў вызваленні бел. зямлі; масавы гераізм і асобныя подзвігі сав. воінаў і партызанаў, іх баявыя аперацыі.

Тэматычныя раздзелы экспазіцыі: 1) падзеі на фронце ў першы перыяд вайны (чэрв. 1941 — ліст. 1942), у т. л. ваен. дзеянні на Беларусі ў 1941, абарона Брэсцкай крэпасці-героя і гарадоў-герояў; 2) акупацыйны рэжым і злачынствы нямф.-фаш. захопнікаў на Беларусі; 3) партыз. рух і дзейнасць падпольных арг-цый на Беларусі ў першы перыяд вайны; 4) сав. тыл — фронту; 5) падзеі на фронце ў перыяд карэннага пералому ў ходзе вайны (ліст. 1942—43); 6) усенародная партыз. вайна на Беларусі (1943—44), у т. л. партыз. краі і зоны, «рэйкавая вайна»; 7) падзеі на фронце ў трэці перыяд вайны (1944—45), у т. л. *Беларуская аперацыя 1944*, вызв. місія Сав. Арміі, разгром і капітуляцыя фаш. Германіі; 8) паражэнне і капітуляцыя Імперыялісг. Японіі; 9) мемарыяльныя залы.

Сярод экспанатаў — баявыя сцягі сав. вайсковых часцей, партыз. брыгад і атрадаў Беларусі; стралковае і артыл. ўзбраенне, у т. л. самаробныя аўтаматы, гарматы, гранатамёты, міны, а таксама баявая амуніцыя партызанаў; абсталяванне партыз. майстэрняў, дзе выраблялі і рамантавалі зброю, друкарняў; лістоўкі, газеты і часопісы армейскіх палітарганаў; падпольны друк парт. і камсамольскіх арг-цый, у т. л. газ. «Звязда», выдадзеная ў Мінску ў 1942; пасцонныя газеты, баявыя лісткі, рукапісныя часопісы бел. партызанаў; дзённікі і лісты праслаўленых партызанаў Беларусі і воінаў Сав. Арміі; трафеі Сав. Арміі і бел. партызанаў. Есць унікальныя экспанаты — прабітыя кулямі ў баі парт. і камсамольскія дакументы воінаў і партызанаў, імянная зброя, перадсмяротныя лісты тых, што загінулі, лістоўкі, надрукаваныя на бляросце, і інш. У экспазіцыі багата твораў жывапісу, скульптуры, дыярамы і макеты («Партызанскі лагер», «Рэйкавая вайна», «Фашысцкі лагер смерці Малы Трасцянец» і інш.), электрыфікаваныя карты, стэндавыя кінаўстаноўкі для дэманстрацыі дакумент. кінафільмаў.

У мемарыяльных залах пералічаны назвы каля 800 вайск. фарміраванняў, якія праславіліся ў баях пры вызваленні Беларусі; 199 партыз. брыгад і 105 асобна дзейных атрадаў, што змагаліся з нямф.-фаш. захопнікамі па тэр. акупаванай Беларусі; 10 падпольных абкомаў, 185 міжрайкомаў, гаркомаў і райкомаў КП(б)Б; 10 падпольных абкомаў і 210 міжрайкомаў, гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ; увекавечаны імёны Герояў Сав. Саюза: 410 воінаў — ураджэнцаў Беларусі; больш за 1300 воінаў, якія вызначыліся ў баях на бел. зямлі, 87 бел. партызанаў і 50 кавалераў ордэнаў Славы трох ступеняў — ураджэнцаў Беларусі.

У музеі чытаюцца тэматычныя лекцыі, наладжваюцца сустрэчы з ветэранамі вайны, камсамольскія сходы, піянерскія зборы, уручаюцца камсамольскія білеты, урадавыя ўзнагароды, маладыя воіны прымаюць воінскую прысягу. Музей арганізоўвае перасоўныя выстаўкі, экскурсіі па памятных мясцінах, ажыццяўляе метадычную дапамогу абласным, раённым, вайсковым краязнаўчым музеям рэспублікі, музеям баявой і прац. славы. У музеі ёсць фондасховішча, фотатэка, навук. архіў, працуе кіналекторый. У 1969 музей наведала 358 тыс. чал. Філіялы: *Абласны музей камсамольскай славы*, мемарыяльны комплекс *Хатынь* у Лагойскім р-не Мінскай вобл., створаны на месцы вёскі, спаленай нямф. фашыстамі разам з жыхарамі; *Курган Славы ў гонар Савецкай Арміі* (на 21 км Маскоўскай шашы). *Я. К. Габец.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя У. І. Леніна (БДУ), заснаваны ў Мінску 11.7.1921. Імя Леніна прысвоена ў 1949. Пастанова пра адкрыццё БДУ прынята Прэзідыумам ЦВК БССР 25.2.1919. Урад РСФСР даручыў наркому асветы А. В. Луначарскаму стварыць у Маскве камісію для садзеяння арг-цыі БДУ. Узначаліў яе рэктар Маскоўскага ун-та В. П. Волгін. У Мінску пачала працаваць дзярж. камісія на чале з вядомым сав. вучоным У. І. Пічэтам, які потым стаў першым рэктарам БДУ (1921—29). АН СССР, Расійская цэнтр. кніжная палата, Маскоўскі, Петраградскі і Кіеўскі ун-ты перадалі БДУ вял. колькасць навук. літаратуры. Акрамя таго, ун-т атрымаў б-кі акад. Я. Ф. Карскага, этнографа М. А. Янчука і інш. У стварэнні БДУ ўдзельнічаў А. Ф. Мяснікоў. Акупацыя бурж. Польшчай у 1919—20 частк Беларусі на 2 гады затрымала адкрыццё ун-та. Для работы ў БДУ былі запрошаны вучоныя з Масквы, Петраграда, Кіева, Смаленска і інш. гарадоў. Спачатку БДУ меў ф-ты: рабочы, грамадскіх навук, медыцынскі. Пазней створаны педагагічны з 4 аддзяленнямі (літ.-лінгвістычнае, якое мела бел., рус., польскую і яўр. секцыі, сацыяльна-гістарычнае, фіз.-матэматычнае і прыродазнаўчае); хім.-тэхналагічны; пар. гаспадаркі; права і

сав. будаўніцтва; завочны і інш. Аспірантура з 1927. У 1930—32 на базе асобных ф-таў БДУ у Мінску арганізаваны *Мінскі медыцынскі інстытут, Мінскі педагагічны інстытут, Беларускі інстытут народнай гаспадаркі; Мінскі юрыдычны інстытут*, шэраг галіновых ВНУ, якія ў 1933 увайшлі ў склад *Беларускага політэхнічнага інстытута.*

Вялікую ролю адыграў БДУ ў стварэнні АН БССР, Дзярж. б-кі БССР імя Леніна і інш. н.-д. устаноў. У гады Айч. вайны нямф. захопнікі знішчылі навуч.-матэрыяльную базу ун-та. Часова перапыненыя заняткі аднавіліся ў 1943 пад Масквой на ст. Сходня Акцябрскай чыгункі; практычныя заняткі вяліся ў лабараторыях Маскоўскага ун-та. 12.9.1944 БДУ аднавіў работу ў Мінску. За пасляваенныя гады адноўлены разбураныя і пабудаваны новыя навуч. карпусы, лабараторыі, інтэрнаты, базы для практыкі студэнтаў. У 1969/70 навуч. г. БДУ меў 13 факультэтаў: фізічны, матэматычны, хімічны, біялагічны, геаграфічны, юрыдычны, гістарычны, філалагічны, журналістыкі; завочнага навучання; падрыхтоўчы (для замежных грамадзян); 2 ф-ты павышэння кваліфікацыі — выкладчыкаў фізікі і матэматыкі ВНУ і выкладчыкаў сярэдніх спец. навуч. устаноў. Рыхтуе спецыялістаў па радыёфізіцы, электроніцы, вылічальнай матэматыцы, праваznаўстве, палітэканоміі, філасофіі, бел. і рус. мовах і літаратурах і інш. (усяго 15 спецыяльнасцей, у т. л. 44 спецыялізацыі). У 1969/70 навуч. г. займалася 16 399 студэнтаў.

Сярод першых выкладчыкаў вучоныя У. М. Перцаў, В. Н. Дзякаў, Ц. М. Годнеў, І. І. Замоцін, М. М. Піятуховіч, І. М. Салаўёў, М. М. Нікольскі, С. Я. Вальфсон, М. А. Прыляжаеў, Б. Я. Эльберт, М. Б. Кроль, В. А. Ліопаў, С. М. Мелкіх, С. М. Рубашоў, Я. І. Барычэўскі, В. М. Беркенгейм, А. А. Міхайлоўскі, П. А. Маўрадыядзі, А. У. Фядзюшын, М. А. Янчук, бел. пісьменнік К. М. Міцкевіч (Я. Колас). У сярэдзіне 20-х г., у 30-я г. напярэдадні Айч. вайны і пасля яе ва ун-це працавалі бел. вучоныя Ц. Л. Бурстын, А. І. Лур'е, М. Е. Макушок, М. М. Паўлючэнка, А. Я. Прапаўчук, І. М. Сяржанін, М. Н. Шапіра, М. Ф. Яромоленка і інш. У розны час ун-т узначальвалі рэктары П. В. Саевіч, В. Н. Дзякаў, П. П. Савіцкі, У. А. Тамашэвіч, І. С. Чымбург, К. І. Лукашоў і інш. За гады існавання ун-т падрыхтаваў больш як 25 тыс. спецыялістаў. Сярод яго выхаванцаў — акад. АН СССР Л. А. Арцымовіч; акадэмікі АН БССР А. С. Махнач, А. Н. Сеўчанка, Ф. І. Фёдараў; чл.-кар. АН СССР А. А. Шлык, члены-карэспандэнты АН БССР П. І. Вялькевіч, М. І. Міцкевіч, бел. пісьменнікі К. Чорны, К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, П. Трус, Я. Скрыган, І. Мележ і інш. У 1970 на 85 кафедрах 1373 навук. работнікі, сярод іх 77 праф. і д-роў н. (у т. л. 1 чл.-кар. АН СССР, 2 чл.-кар. АПН СССР, 14 акад. АН БССР, 4 чл.-кар. АН БССР, 1 чл.-кар. АН Каз. ССР), 383 дацэнты і кандыдаты навук. Прафесары і дактары навук ун-та: Л. С. Абэцэдарскі, М. М. Авакаў, Ю. А. Альдэкоп, Дз. М. Андрэеўскі, Ю. С. Багданаў, П. А. Вуланаў, М. Г. Булахаў, У. Г. Вафіядзі, Л. В. Валадзько, А. С. Вечар, В. І. Вядзернікаў, Р. Габасаў, І. І. Гарэлік, Ф. І. Гаўрае, Ф. Дз. Гахаў, Ц. М. Годнеў, Г. П. Давідзюк, М. А. Дарожкін, В. А. Дзяменцьеў, А. В. Дулаў, М. А. Ельяшэвіч, М. А. Жыдовіч, А. Я. Журавёў, В. Р. Заўрыеў, І. М. Ігнаценка, І. А. Інсараў, П. М. Карэлін, А. П. Кесарава, Ф. М. Кірылава, Ф. І. Кіслёў, А. К. Красін, У. І. Крылоў, Р. А. Кулляшоў, М. Р. Ларчанка, А. Я. Левашоў, А. В. Левін, Г. М. Ліўшыц, І. М. Лушчыцкі, А. С. Лыкаў, С. М. Малінін, І. І. Марціновіч, А. С. Махнач, Л. Р. Міхайлаў, А. Р. Мядзведзеў, І. Р. Некрашэвіч, Ф. М. Нячай, М. П. Палетыка, А. М. Пісарэўскі, У. П. Платонаў, І. А. Прусаў, В. А. Пыжкоў, П. Ф. Ракіцкі, У. М. Сікорскі, У. Г. Спрынджук, Р. Л. Старобінец, А. Я. Супрун, В. І. Сцяпанаў, І. М. Сяржанін, В. Дз. Ткачоў, Р. М. Трухноў, М. В. Турбін, А. Х. Турэцкі, Ю. К. Фамічоў, Ф. І. Фёдараў, Л. І. Фіглоўская, І. Р. Цішчанка, Л. С. Чаркасава, Л. М. Шакун, А. Г. Шашкоў, А. Х. Шкляр, М. Я. Шкляр, А. А. Шлык, Л. М. Шнеерсон, Р. С. Юньеў, М. Р. Юркевіч, М. П. Яругін. Рэктар акад. АН БССР праф. А. Н. Сеўчанка (з 1957).

Асн. даследаванні ў галіне спектраскапіі і люмінесцэнцыі радыяцыйнай фізікі паўправаднікоў, квантавай радыёфізікі, фотаэлектрычнай аўтаматыкі і самарэгулявальных сістэм, тэорыі дыферэнц. ураўненняў, краявых задач, тэорыі лікаў і тапалагічных груп, фотасінтэзу, біял. дзеянняў іанізуючага выпрамянення на арганізм, малекулярнай біялогіі, хіміі цвёрдага цела і каардынацыйных злучэнняў, радыкальнай полімерызацыі і арган. сінтэзу, марксісцка-ленінскай філасофіі і палітэканоміі, педагогікі, бел. мовы і л-ры. Ун-т мае права прымаць да абароны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па фізіка-матэм., хім., біял., геагр., філал., гістар., эканам., філас., юрыд. навуках. Вучоныя звязаны з прамысл. прадпрыемствамі, удзельнічаюць ва ўсесаюзных і міжнар. канферэнцыях, нарадах і сімпозіумах. БДУ мае вылічальны цэнтр, 10 н.-д. лабараторый, у т. л. 3 праблемныя [паўправадніковай тэхнікі, эксперыментальнай біялогіі (комплексная), сацыялагічных даследаванняў], фундаментальную б-ку (920 тыс. тамоў), выдавецтва, біял. станцыю на воз. Нарач, н.-д. станцыю каля в. Шчомысліцы Мінскага р-на, бат. сад, гістар., геолага-мінералагічны і заалагічны музеі, выпускае шматтыражную газ. «Беларускі універсітэт» (з 1923) і навук. часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна» (са студз. 1969, у 4 серыях). 7.1.1967 БДУ ўзнаг. ордэнам Працоўнага Чырв. Сцяга. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина, Мн., 1962; Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921—1927. Да 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Мн., 1927; Севченко А. Кузница кадров, «Коммунист Белоруссии», 1962, № 10; Малышев А. Имени Ленина..., «Коммунист Белоруссии», 1968, № 7.

С. А. Умрэйка. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР, гл. *Беларускі тэатр імя Якуба Коласа.*

БЕЛАРУСКІ ЗАПРАЖНЫ КОНЬ, народная група коней аблегчанага цяжкавознага тыпу. Выведзена ў канцы 19 ст. скрыжаваннем мясцовых і ардэнскай, брэтонскай, бельгійскай, гудбрандсальскай цяжкавозных парод. Адборам і падборам замацоўваюцца прыстасаванасць да кліматычных умоў БССР і выносліваць. Масць гнядая, рыжая, бурая, варанай і буланая. Выш. ў карку 152—156 *см*, косая даўж. тулава 158, абхват грудзей 193, пясці 22 *см*. Жывая маса 600—700 *кг*. Б. з. к. у адзіночнай запражцы па грунтавой і нават пясчанай дарозе можа везці да 800 *кг*, без грузу прабягае 24—25 *км* за 2 *гадз*. Выкарыстоўваецца на лёгкіх транспартных і сельскагаспадарчых работах з 2,5 года. Б. з. к. гадуюць пераважна ў Гродзенскай і Мінскай

абл. Ін. гл. на ўкл. Пароды коней да арт. *Конегадоўля.*

«БЕЛАРУСКІ ЗВОН», рэакцыйная газета, якую выдавала нацыяналістычная групоўка *Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый* (Цэнтрасаюз). Выходзіла ў Вільні на бел. мове з 6.1.1931 да 2.12.1932 замест газ. *«Наперад»* (выдавалася з 12.12.1929). Вяла кампанію супраць БССР, КПЗБ і дэмакр. арг-цый Зах. Беларусі. Заклікала польскі і міжнар. імперыялізм да паходу на СССР. Выйшла 58 нумароў. Мела толькі 15 сталых падпісчыкаў. Спыніла сваё існаванне з-за паліт. банкруцтва Цэнтрасаюза.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ГАСПАДАРКІ І КУЛЬТУРЫ (БІГіК), дробнабурж. нацыяналістычная культурна-асветніцкая арганізацыя. Створаны ў чэрв. 1926 у Вільні і Варшаве з дапамогай *Беларускага сялянскага саюза* і *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* ў процівагу *Таварыству беларускай школы* (ТБШ). БІГіК меў на мэце вырваць працоўных з-пад уплыву КПЗБ і прагрэсіўных нац.-вызв. арг-цый Зах. Беларусі. На гэта былі накіраваны яго мерапрыемствы па стварэнні кааператываў, б-к, клубаў, па распаўсюджванні асветы і с.-г. ведаў. Але ў 20-я г. ў выніку дзейнасці рэвалюц.-дэмакр. і нац.-вызв. арг-цый *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ), *«Змагання»* і ТБШ не меў значнага ўплыву. Актывізаваўся ў 1931—34, калі польскія ўлады разгромілі БСРГ і «Змаганне» і значна абмежавалі ТБШ. У 1936 ва ўмовах узмацнення барацьбы за стварэнне антыфаш. фронту арг-цыі БІГіК пад націскам працоўных і радавых членаў выступілі супольна з ТБШ за адкрыццё бел. школ і ажыццяўленне інш. агульнадэмакратычных патрабаванняў. Шырокаму супрацоўніцтву гэтых арг-цый перашкодзіла згодніцкая палітыка кіраўнікоў БІГіК. Забаронены польскімі ўладамі 4.12.1936. У час ням.-фаш. акупацыі БССР бурж. нацыяналісты з кіраўніцтва БІГіК (В. Рагуля і інш.) перайшлі на службу да гітлераўцаў.

Літ.: Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине, Мн., 1935; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966; Полуян В. А. и Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии, Мн., 1962.

У. А. Палуян. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ІНЖЫНЕРАЎ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ, заснаваны ў 1953 у Гомелі. Рыхтуе інжынераў па эксплуатацыі чыгункі, вагонабудаванні і вагоннай гаспадаркі, прамысловым і грамадзянскім буд-ве, буд-ве чыгунак, пуцявой гаспадаркі, аўтаматыцы, тэлемеханіцы і сувязі. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: эксплуатацыі чыгункі, механічны, буд-ва чыгункі, прамысл. і грамадз. буд-ва, вячэрні, завочны і павышэння кваліфікацыі. Завочны ф-т мае навучальна-кансультац. пункты ў Мінску, Брэсце, Баранавічах, Віцебску. Аспірантура з 1954, 4 праблемныя лабараторыі, б-ка. У 1969/70 навуч. г. займалася 5000 студэнтаў.

У 1970 на 28 кафедрах 240 выкладчыкаў, у т. л. 9 праф. і дактароў навук, 100 дацэнтаў і канд.



Будынак Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту.

навук. Прафесары і д-ры навук: В. І. Даўнаровіч, Я. Дз. Дзіранок, П. К. Кругер, М. З. Крываручка, І. І. Купчынаў, В. М. Максімовіч, У. М. Праўдзін, М. В. Сядзенка, І. Г. Ціхаміраў. Рэктар канд. тэхн. н. П. А. Сыцко (з 1961).

Асн. даследаванні: праблема павелічэння масы і скорасці руху паяздоў; праектаванне, выраб і выпрабаванні ізаляцыйных і амартызацыйных дэталяў верхняй будовы пуці; механізацыя пагрузачна-разгрузачных і пуцявых работ. Ін-т прымае да абароны канд. дысертацыі па спецыяльнасцях: рух паяздоў і рухомы састаў. *П. А. Сыцко.* Гомель.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ПАРТАКТЫВУ пры ЦК КП(б)Б (БІМЗН), філіял Усесаюзнага інстытута масавага завочнага навучання пры ЦК ВКП(б). Існаваў з 21.2.1931 да 21.8.1938 у Мінску. Ажыццяўляў ідэйна-паліт., арганізацыйнае і праграмна-метадычнае кіраўніцтва ўсімі відамі масавай завочнай парт. асветы ў рэспубліцы. Сектары: навучальна-метадычны, радыёвяшчання. Кафедры: гісторыі ВКП(б) і КП(б)Б, эканомікі, гісторыі СССР і БССР, гісторыі класавай барацьбы, марксізма-ленінізма, агратэхнікі. Меў аддзяленні завочнага навучання амаль ва ўсіх раёнах Беларусі. Выдаваў час. «Завочнік Беларусі». *Л. Ф. Саковіч.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ МЕХАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, заснаваны 1.9.1954 у Мінску. Рыхтуе інжынераў-механікаў па механізацыі с. гасп., рамонце с.-г. машын, інжынераў-электрыкаў па электрыфікацыі с.-г. вытворчасці. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.:

Будынак Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі.













Беларускі дзяржаўны універсітэт.


1. Галоўны корпус.
2. Будынак фізічнага факультэта.
3. Новы корпус хімічнага факультэта.
4. Практычныя заняткі па фізічнай хіміі.
5. Студэнты гістарычнага факультэта ў археалагічнай экспедыцыі.
6. У праблемнай лабараторыі паўправадніковай тэхнікі.
7. Спартыўныя студэнцкія спаборніцтвы па баскетболе.
8. На лекцыі ў вялікай аўдыторыі.
9. У спартыўна-аздараўленчым лагеры універсітэта на возеры Нарач.












1



2



3

Беларускі політэхнічны інстытут.

1. Галоўны корпус.
2. Студэнты інжынерна-тэхналагічнага факультэта на лекцыі.
3. Клас праграмаванага навучання.
4. У лабараторыі кафедры апрацоўкі металу ціскам.
5. Практычныя заняткі ў лабараторыі ліцейнай вытворчасці.
6. У лабараторыі вымяральных прылад.
7. Спартыўныя заняткі па фехтаванні.
8. Выступленне студэнцкага калектыву мастацкай самадзейнасці.




4



5



6



7



механізацыі; электрыфікацыі; арг-цыі і тэхналогіі рамонту машын; завочны; павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў, спецыялістаў с. гасп. Аспірантура з 1956, н.-д. лабараторыі, 6-ка. У 1969/70 навуч. г. займалася 4104 студэнты.

У 1970 на 27 кафедрах 252 выкладчыкі, у т. л. 4 праф. і дактары навук, 94 дацэнты і канд. навук. Прафесары і д-ры навук: І. І. Гарус, І. Ф. Кудраўцаў, Д. А. Чудакоў, М. А. Шчэрбаў. Рэктар канд. тэхн. н. С. С. Сяліцкі (з 1969).

Асн. праблематыка даследаванняў: удасканаленне сістэм і тэхналогіі машын, арг-цыя механізаваных работ у с. гасп.; распрацоўка навук. асноў рамонтнай вытворчасці, павышэнне надзейнасці, даўгавечнасці трактароў, с.-г. машын; павышэнне прадукцыйнасці раслінаводства і жывёлагадоўлі. Мае н.-д. гаспадарку ў пас. Бараўляны Мінскага р-на.

Дз. І. Горын. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ імя В. У. Куйбышава, заснаваны 1.6.1933 у Мінску на базе ф-та народнай гаспадаркі *Беларускага дзяржаўнага універсітэта*. Рыхтуе спецыялістаў па планаванні нар. гасп., прамысловасці, с. гасп.; планаванні цэн і сабекошту; эканоміцы і арг-цыі мат.-тэхн. забеспячэння; бухгалтарскім уліку ў прамысловасці, с. гасп., гандлі і ў банках;



Навучальны корпус Беларускага інстытута народнай гаспадаркі.

статыстыцы; фінансах, фінансах прамысл. прадпрыемстваў, грашовым абарачэнні і крэдыце; таваразнаўстве і арг-цыі гандлю прамысл. і харч. тавамі. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: планава-эканамічны, улікова-эканамічны, фінансава-эканамічны, гандлёва-таваразнаўчы, эканомікі прамысловасці, завочныя (планава-эканамічны, улікова-фінансавы, гандлёва-эканамічны), вячэрні, павышэння кваліфікацыі. Аспірантура з 1961, праблемная лабараторыя, 6-ка. У 1969/70 навуч. г. займалася 8979 студэнтаў.

У 1970 на 31 кафедры 360 выкладчыкаў, у т. л. 11 праф. і дактароў навук, 177 дацэнтаў і канд. навук. Прафесары і д-ры навук: Я. К. Анджан, Г. І. Бакланаў, М. І. Брагінскі, М. І. Вядута, М. В. Дземянёў, М. У. Дэмбінскі, Ф. Т. Касцюковіч, Ф. С. Марцінкевіч, П. Дз. Пузікаў, А. С. Сітніцкі, К. І. Шабуня. Рэктар канд. эканам. н. Ф. В. Баравік (з 1969).

Асн. праблематыка даследаванняў: павышэнне эканам. эфектыўнасці грамадскай вытворчасці; прававое рэгуляванне эканам. адносін; павышэнне якасці, надзейнасці і даўгавечнасці прадукцыі; праблемы эканамічнай рэформы 1965. Мае права прымаць да абароны канд. дысертацыі па эканам. навуках.

Ф. В. Баравік. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ, заснаваны 22.7.1937 у Мінску на базе Мінскага тэхнікума фізічнай культуры. Рыхтуе выкладчыкаў фіз. культуры і трэнераў па відах спорту. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: пе-



Будынак Беларускага інстытута фізічнай культуры.

дагагічны, спартыўны, завочны. На правах ф-та з 1959 працуе школа трэнераў. Аспірантура з 1966. Выпускнікі ін-та 19 разоў заваёўвалі званні чэмпіёнаў і прызёраў Алімп. гульняў, 39 разоў — чэмпіёнаў свету і Еўропы. Сярод іх лёгкаатлеты М. Крываносаў, М. Іткіна, Р. Клім, барцы А. Караваеў і А. Мядзведзь, фехтавальшчыкі А. Чарнушэвіч, А. і Дз. Ніканчыкавы, весляры С. Макаранка, В. Навумаў. У 1969/70 навуч. г. займалася 2572 студэнты.

У 1970 на 17 кафедрах 215 выкладчыкаў, сярод іх 3 праф. і дактары навук, 45 дацэнтаў і канд. навук. Прафесары і д-ры навук: М. І. Арынчын, М. М. Быкаў, А. Дз. Геўліч. Рэктар канд. пед. н. К. А. Кулінковіч (з 1970).

Ін-т — цэнтр н.-д. і метадычнай работы ў галіне фіз. культуры і спорту ў БССР. Ін-т распрацоўвае праблемы ўдасканалення метадаў і сродкаў фіз. выхавання, тэхнікі спарт. рухаў, арг-цыі фізкультурнага руху. У 1937 узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Л. І. Жарыкаў. Мінск.

БЕЛАРУСКІ КОМПЛЕКС (беларуская серыя, палеская серыя), адклады пратэніжняй часткі геал. разрэзу верхняга пратэразою на захадзе Рускай платформы (БССР, УССР, РСФСР). Тэрмін прапанаваны ў 1956 А. С. Махначом, назва палеская серыя — у 1957 Л. П. Брунс. Б. к. складзены з чырвана-колерных пясчаных, алеўрытавых і гліністых парод, часам з пластамі даламітаў. На Беларусі магутнасць Б. к. да 700 м. Тут вылучаюцца рагачоўская, аршанская і пінская світы (гл. адпаведныя артыкулы). Найбольш тыповыя разрэзы вывучаны ў Мінску, Пінску, Магілёве, Оршы, Рагачове і інш. У адкладах Б. к. ёсць мінер. воды. Гл. таксама *Пратэразойская эра (група)*.

БЕЛАРУСКІ КРЫШТАЛІЧНЫ МАСІЎ (Беларуска-Літоўскі крышталіч-

ны масіў, Мазурска-Беларуская антэкліза), вялікае ўзвышэнне крышталічнага фундамента на захадзе Рускай платформы. Ахоплівае ПнЗ і цэнтр. частку Беларусі, невялікія плошчы на ПдУ Літвы і ПнУ Польшчы. Ніжняя мяжа масіву на тэктанічнай карце акрэсліваецца ўмоўна ізагіпсай 500 *м* ніжэй узр. м. Скляпеністая частка масіву (вышэй ізагіпсы — 100) цягнецца ў субшыротным напрамку. У межах скляпення назіраецца шэраг параўнальна невялікіх узвышэнняў фундамента (тэктанічныя структуры 2-га парадку), дзе яго паверхня размяшчаецца на глыбіні ад 50 *м* ніжэй узр. м. да 87 *м* над узроўнем. Найбольш прыўзнятая ч. масіву — *Бабаўнянскі выступ*. Унутраная структура фундамента характарызуецца развіццём лінейных складак паўн.-ўсх. прасцягу, размешчаных амаль перпендыкулярна распасціранню больш прыўзнятай ч. паверхні крышталічных парод. У асадкавым чахле найбольш прыўзнятай часткі Б. к. м. пашыраны адклады верхняга пратэразою (беларускі і вендскі комплексы), верхняга мелу і кайназою. На паўд., зах. і паўд.-зах. схілах масіву ёсць таксама адклады ніжняга палеазою, на ўсходніх — сярэдняга дэвону, зах. і паўд.-зах. схілах — верхняй юры. Фарміраванне Б. к. м. як самастойнай структуры пачалося ў канцы пратэразою — пачатку палеазою. На працягу амаль усяго палеазою і большай ч. меза-кайназою тэрыторыя масіву слаба, але ўстойліва паднімалася. Толькі ў позненемелавую эпоху, часамі ў палеагене, большая ч. масіву апускалася і была заліта морам. У пародах крышталічнага фундамента Б. к. м. выяўлены жалезныя руды (каля Карэліч і Шчучына). Ёсць перспектывы на выяўленне рэдкіх і рассеяных элементаў, баксітаў і інш.

Літ.: Геология и перспективы металлоносности докембрия Белоруссии и смежных районов. Мн., 1965. *З. А. Гарэлік.* Мінск.

«БЕЛАРУСКІ ЛЕТАПІС», штомесячны прагрэс. культурна-грамадскі і літаратурны ілюстраваны часопіс. Выдаваўся на бел. мове ў Вільні з мая 1933 да вер. 1939. Да ліст. 1933 і ў студз.— сак. 1936 выходзіў пад назвай «Летапіс Таварыства беларускае школы» (9 нумароў) як орган *Таварыства беларускай школы* (ТБШ), у крас.— жн. 1936 пад назвай «Летапіс» (5 нумароў у адной кніжцы; на тытульнай старонцы «Летапіс ТБШ»). У 1934—35 не выдаваўся з прычыны забароны ТБШ польскімі бурж. ўладамі. З снеж. 1936 наз. «Беларускі летапіс» (17 нумароў). Ідэйны кірунак «Б. л.» вызначалі дзеячы ТБШ Р. Шырма і С. Паўловіч, а таксама М. Танк (з 1936 вёў літ. аддзел). У часопісе друкаваліся П. Пестрак, М. Васілёк, А. Іверс, М. Машара, Г. Новік, Н. Тарас, А. Дубровіч і інш. зах.-бел. пісьменнікі. Абараняў права працоўных Зах. Беларусі вызначаць свой лёс, развіваць нац. культуру і мастацтва. Падтрымліваў платформу Нар. фронту. Папулярызаваў вусную нар. творчасць (публікацыі Р. Шырмы), крытыкаваў мадэрнісцкія тэндэнцыі і праявы бурж.-нацыяналіст. абмежаванасці ў зах.-бел. культуры і л-ры. Рэдактар-выдавец адвакат Ф. Стацкевіч.

У. А. Калеснік. Брэст.

БЕЛАРУСКІ МУЗЕЙ у Вільні. Узнік у 1921 на базе прыватнай калекцыі бел. этнографа і археолага Івана Луцкевіча і інш. матэрыялаў. Размяшчаўся ў будынку б. базыліянскага манастыра. У музеі зберагаліся рэдкія калекцыі: археалагічная (з раскопак на Беларусі Я. П. Тышкевіча, І. Луцкевіча і інш.), сфрагістычная (103 адзінкі), нумізматычная; калекцыі медалёў, крыжоў, свінцовых пломбаў 12—13 ст., выяўленых у Драгічыне; зборы слуцкіх паясоў, дываноў Нясвіжскай ф-кі і Гродзенскай ф-кі Тызенгаўзена, бел. народных інструментаў, твораў бел. народных разьбяроў, карціны мастакоў 16—18 ст. У калекцыі рукапісаў — ілюстраванае Жухавіцкае евангелле 14 ст., трэбнік Жыровіцкай царквы 1545, кніга бел. мусульман Аль-Кітаб 16 ст., стараж. бел. граматы, статут брацтва ў Дзісне 17 ст., бел. пераклады «Александрыі» і «Аповесці пра Баву» 18 ст. і інш. Збор кніг 15—18 ст. з друкарняў Вільні, Гродна, Еўя, Заблудава, Кракава, Куцейна, Магілёва, Нясвіжа, Полацка, Слуцка, у т. л. Трыёдзь каляровая 1491 Ш. Фіёля, Часаслоў 1565 Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца, першае выданне Літоўскага Статута 1588 братоў Мамоничаў. Сярод каштоўных экспанатаў пячаткі полацкіх князёў Усяслава і Барыса, Галоўнага трыбунала і войска Вял. кн. Літоўскага; галаснікі Каложскай царквы ў Гродне; сцяг бел. паўстанцаў Лідскага пав. 1863, арыгіналы дарэвалюц. твораў Я. Купалы, М. Багдановіча, першыя выданні твораў В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча. У бібліятэцы Б. м. былі зборы І. Луцкевіча і частка б-кі Е. Раманава (больш за 14 000 тамоў). У 1946 найбольш каштоўныя экспанаты перададзены ў гісторыка-этнаграфічны музей АН Літ. ССР у Вільнюсе.

Літ.: Глаазырын В. Беларускі музей у Вільнюсе, «Літаратура і мастацтва», 1941, 15 лют., № 7. *Л. Дз. Клок.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ МУЗЫЧНА-ДРАМАТЫЧНЫ ГУРТОК у Вільні, працаваў у 1910—15 і 1916. Аб'ядноўваў бел. інтэлігенцыю горада. Наладжваў *беларускія вечарынкі*, адыграў значную ролю ў станаўленні бел. прафесіян. т-ра. Спектаклі: «Па рэвізіі» (1910) і «Пашліся ў дурні» (1912) М. Крапіўніцкага, «Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча з музыкай М. Кімант-Яцыны (1915), «Модны шляхцюк» К. Каганца, «У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі і інш. Упершыню сіламі гуртка была пастаўлена п'еса Я. Купалы «Паўлінка» (27.1.1913). Сярод удзельнікаў гуртка: І. *Буйніцкі*, А. *Бурбіс*, З. *Бядуля*, Л. *Родзевіч*, П. *Мядзёлка*.

Літ.: Нлфёд У. Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі, Мн., 1959, с. 86—89.

БЕЛАРУСКІ МУЗЫЧНЫ ТЭХНІКУМ, гл. *Мінскае музычнае вучылішча*.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ УНІВЕРСІТЭТ, культурна-асветная ўстанова. Працаваў у Маскве з 11 ліп. да 12 жн. 1918. Арганізаваны

культ.-асвет. аддзелам Беларускага нац. камісарыята, каб даць слухачам неабходныя звесткі па бел. гісторыі, л-ры, мове, эканоміцы, геаграфіі і інш. Займалася 57 чал., пераважна настаўнікі, прадстаўнікі пар. асветы і культ.-асвет. арг-цый Беларусі, у т. л. з часова акупаваных раёнаў рэспублікі.

Ва ун-це выкладалі: географ акад. Дз. М. Анучын, гісторык праф. У. І. Пічэта, статыстык праф. А. Ф. Фартунатаў, славіст праф. А. М. Ясінскі, лінгвіст П. А. Растаргуеў; работнікі Белнацкома З. Ф. Жылуновіч (Ц. Гартны), Я. С. Канчар і інш. Загадчык ун-та П. А. Урбановіч. Частка прачытаных лекцый выдадзена ў 1918—20 у Маскве Бел. пададдзелам аддзела асветы нац. меншасцей Наркамасветы РСФСР як дапаможнік для настаўнікаў школ Беларусі пад назвай «Курс белорусазнаўства».

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІСАРЫЯТ (Белнацком), адзін з аддзелаў Наркампаца РСФСР. Створаны паводле ленінскага дэкрэта ад 31.1.1918. Першы камісар Белнацкома А. Р. *Чарэлкоў*. Сваю дзейнасць Белнацком накіроўваў на развіццё культуры і нац. дзяржаўнасці бел. народа; клапаціўся пра бежанцаў-беларусаў у Расіі, вёў сярод іх паліт. і культ.-асветніцкую работу, змагаўся з нацыяналізмам, згуртоўваў бел. працоўных вакол Сав. улады. Меў аддзелы: агітацыйна-палітычны, культурна-асветніцкі, бежанскі, выдавецкі і інш. У Петраградзе, Смаленску і Віцебску адкрыў аддзяленні. Друкаваны орган — газ. *«Дзянніца»*. Прадстаўнікі Белнацкома ўвайшлі ў склад Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. Ліквідаваны ў сак. 1919 у сувязі з утварэннем БССР.

В. А. Круталевіч. Мінск.

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ (БНК), прадстаўнічы орган беларускіх паліт. партый і грамадскіх арганізацый Зах. Беларусі і Польшчы. Існаваў у Вільні ў 1921—39. У БНК уваходзілі прадстаўнікі *Беларускага насольскага клуба*, *Таварыства беларускай школы* (ТБШ), *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* (БХД), Камітэта дапамогі ахвярам вайны, Студэнцкага саюза, Выдавецкага і навук. т-ва, Бацькоўскага к-та, рэдакцый бел. газет, інш. партый і арг-цый. У перыяд дзейнасці *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ, 1925—27) БНК поўнасцю быў пад яе ўплывам. Пазней узмацніўся ўплыў бел. бурж. нацыяналістаў і БНК раскалоўся: частка трапіла пад уплыў БХД, другая — т. зв. *Беларускай санацыі*.

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ, нацыяналістычная, рэфармісцка-згодніцкая арганізацыя. Утвораны ў сак. 1917 пераважна з чл. *Беларускай сацыялістычнай грамады*. Узначальваў буйны памешчык Мінскай губ. Р. А. Скірмунт. Падтрымліваў палітыку Часовага ўрада, выступаў за аўтаномію бел. бурж. рэспублікі. Ліквідаваны ў ліп. 1917, калі ўтварылася *Беларуская рада*.

«БЕЛАРУСКІ ПАРТЫЗАН», падпольны часопіс, орган *Галоўнага штаба беларускіх партызан*. Выдаваўся з жн. да снеж. 1922 на бел. мове кіраўніцтвам партыз. атрадаў, што дзейнічалі ў Лідскім, Гродзенскім, Ваўкавыскім, Бельскім і інш. паветах Зах. Беларусі. Выйшла 4 нумары. Друкаваў матэрыялы пра партыз. рух у Зах. Беларусі, тэрор і рэпрэсіі польскай адміністрацыі над рэвалюцыйна настроенымі працоўнымі і партызанамі, пра надзвыч. і ваенна-палявыя суды над імі.

БЕЛАРУСКІ ПАСОЛЬСКІ КЛУБ, нацыянальная фракцыя паслоў (дэпутатаў) Зах. Беларусі ў польскім сейме ў 1922—28. Узнік у ліст. 1922 з паслоў-беларусаў, выбраных у сейм па спісе блока нац. меншасцей. У клуб уваходзілі 11 паслоў [Б. А. *Тарашкевіч*, С. А. *Рак-Міхайлоўскі*, П. П. *Валошын*, П. В. *Мятла*, В. Рагуля, Ф. Ярэміч і А. Аўсянік — ад *Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі*; С. Баран і С. Якавюк — ад партыі бел. эсэраў; А. Станкевіч — ад *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* (БХД); М. Кахановіч — беспартыйны] і 3 сенатары (В. Багдановіч — ад БХД; А. Уласаў і А. Назарэўскі — беспартыйныя). У 1922—23 старшынёй клуба быў Тарашкевіч, потым Ярэміч. Б. п. к. вызначаўся сацыяльна-паліт. неаднароднасцю і стаяў на згодніцкіх пазіцыях, праводзячы хісткую палітыку ад апазіцыі да згоды з польскім бурж.-памешчыцкім урадам. У 2-й пал. 1923 у Б. п. к. ўтварылася левае рэвалюц.-дэмакр. крыло. У чэрв. 1925 Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Мятла выйшлі з Б. п. к. і ўтварылі клуб *Беларускай сялянска-рабочай грамады*. З гэтага часу ўплыў Б. п. к. ў масах усё больш слабеў. Ён адкрыта заняў нацыяналіст.-згодніцкую пазіцыю, выступаў супраць рэвалюц.-дэмакратычнага і нац.-вызв. руху.

Літ.: Гл. пры арт. *Беларуская сялянска-рабочая грамада*. *У. А. Палуян.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР, гл. *Беларускі тэатр імя Янкі Купалы*.

«БЕЛАРУСКІ ПІЯНЕР», часопіс для дзяцей, які выдаваўся ў 1924—29. Гл. *«Бярозка»*.

БЕЛАРУСКІ ПЛЯМІСТЫ ТРУС, беларускі матылёк, пародная група трусоў. Выведзена ў калгасе «Іскра» Гомельскай вобл. скрыжаваннем плямістых трусоў з мясцовымі і фландрамі. Сярэдняя маса 4,3 *кг*. Б. п. т. мае моцную канстытуцыю, добрыя мясныя якасці, скараспелы. Плоднасць 7—8 трусянят за акот. Поўсць густая, белая з шэрымі або чорнымі плямамі на спіне, баках і галаве. На носе пляма накшталт матыля. Іл. гл. на ўкл. Пароды трусоў да арт. *Трусагадоўля*.

В. І. Арлоўскі. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ПОЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ (БПІ), заснаваны 1.7.1933 у Мінску на базе мінскіх хіміка-тэхналагічнага (з 1930), будаўнічага (з 1930), энергетычнага (з 1930), харчовага (з 1931) і Гарфянога (з 1931), харчовага (з 1931) і Горацкага водна-меліярацыйнага (з 1931) інстытутаў. Спачатку меў 4 ф-ты, рыхтаваў інжынераў 8 спецыяльнасцей. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: аўтатрактарны, машынабудаўнічы, энергетычны, гідратэхн. і дарожнага буд-ва, будаўнічы, механіка-тэхналагічны, інж.-тэхналагічны, інж.-эканамічны, інж.-педагагічны, тарфяны, вячэрні агульнатэхнічны, завочны, павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сярэдніх спец. навуч. устаноў і інж.-тэхн. работнікаў. Філіялы вячэрняга агульнатэхн.

ф-та ў Віцебску, Гомелі і Жодзіне. Аспірантура з 1930, 10 н.-д. лабараторый (у т. л. 4 праблемныя), б-ка (каля 900 тыс. тамоў). У 1969/70 навуч. г. займалася 20,5 тыс. студэнтаў. Інж. кадры рыхтуюцца па 34, аспіранты па 56 спецыяльнасцях.

У БПІ працавалі бел. вучоныя С. І. Губкін, А. А. Краўцоў, В. В. Папоў і інш. У розны час ін-т узначальвалі рэктары І. І. Дружалоўскі, М. С. Позняк, М. В. Дарашэвіч і інш. За гады існавання ін-т падрыхтаваў каля 25 тыс. спецыялістаў. У 1970 на 70 кафедрах больш за 1260 навук. работнікаў, у т. л. 32 праф. і дактары навук, больш за 525 дацэнтаў і канд. навук. Прафесары і д-ры навук: Э. Х. Адэльсні, С. С. Атаеў, І. М. Ахвердаў, Ю. В. Беленькі, Л. Я. Валчок, А. П. Воінаў, З. З. Дудзіч, А. Х. Кім, Г. М. Конін, В. І. Ладыгін, Р. Я. Паспелаў, П. Ф. Пратасеня, Я. Г. Ракаў, А. І. Руцкі, І. І. Саладкоў, М. С. Сачко, В. П. Севярдэнка, А. С. Сітнікаў, Г. К. Татур, У. А. Чантурыя, Г. М. Якаўлеў і інш. Рэктар чл.-кар. АН БССР праф. П. І. Яшчарыцын (з 1962).

Асн. навук. даследаванні ў галіне распрацоўкі і асваення новых метадаў і абсталявання для вытворчасці метал. парашкоў і валокнаў, парашкоў сплаваў і тугаплаўкіх злучэнняў, новых металакерамічных вырабаў для металургіі, машынабудавання, эл. тэхнікі; прамысловай тэхналогіі вытворчасці вырабаў з тэхн. сіталаў; стварэння новых відаў перспектыўных экранам. транспартных сродкаў: павышэння эфектыўнасці цеплавых эл. станцый, надзейнасці і даўгавечнасці дэталяў, машын, штампавага інструменту і інш. Ін-т прымае да абароны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па тэхн. навуках. Н.-д. лабараторыі, кафедры БПІ выконваюць заказы прадпрыемстваў і будоўляў краіны. Ін-т мае шырокія міжнародныя сувязі. Выдае навук. і навучальна-метадычную л-ру, шматтыражную газ. «Советский инженер» (з 1935). На базе ф-таў БПІ створаны *Мінскі радыётэхнічны інстытут, Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут*. 7.1.1967 БПІ ўзнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Белорусский ордена Трудового Красного Знамени политехнический институт. [Альбом]. Мн., 1968. *П. І. Яшчарыцын.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ ПОЛК, пайсковая адзінка, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў час *Вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*. Больш вядомы пад назвай *Чаўскі полк*.

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ КЛУБ, існаваў у Мінску ў 1920—22. Вёў культ.-асветніцкую работу. Пры клубе былі б-ка, чытальня, курсы беларусазнаўства, харавая, муз. і драм. секцыі. Рэжысёры: У. *Галубок*, Ф. *Ждановіч*, В. Сташэўскі. Паказаны спектаклі: «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Суд» і «За мураванай сцяной» Галубка, «Міхалка» Далецкіх і інш. У клубе 15.8.1920 спектаклем «Суд» пачала сваю дзейнасць трупа Галубка.

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР імя Цэнтральнага савета прафсаюзаў Беларусі. Створаны ў 1928 у Мінску з драм. гуртка бухгалтарскіх курсаў як Беларускі рабочы тэатр («Наш тэатр»). Паказваў спектаклі рабочым і сялянам, байцам Чырв. Арміі. Асобныя спектаклі ставілі Ф. Ждановіч, К. Саннікаў, П. Малчанаў. Найб. значныя: «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага, «Будні» І. Гурскага, «Босыя на погпішчы» М. Чарота, «Гірт з воўчага логу» Я. Райніса, «На стыку» Ц. Гартнага. У 1930 перайменаваны ў Бел. рабочы тэатр імя Цэнтр. савета прафсаюзаў Беларусі (т-р імя ЦСПСБ). Пачаў работу 15.5.1930 спектаклем «Стрэл» А. Безыменскага. Існаваў да канца 1933 як вандроўны т-р. Абслугоўваў рабочых рэспублікі пераважна ў аддаленых раёнах. Рэж. В. *Галаўчынер*. З новых пастановак: «Чыггісбуд» К. Федаіна, «Мсціслаў Удалы» І. Прута і інш. *С. А. Пятровіч.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ САВЕТ ПРАФЕСІЙНЫХ САЮЗАЎ (Белсаўпроф), вышэйшы кіруючы орган прафсаюзаў БССР у перыяд паміж з'ездамі. Выбіраецца з'ездам прафсаюзаў Беларусі на 4 гады. Працуе пад кіраўніцтвам ВЦСПС. Для кіраўніцтва штодзённай работай прафс. арганізацый рэспублікі Белсаўпроф стварае Прэзідыум.

Першы орган прафсаюзаў рэспублікі — Цэнтральнае бюро прафсаюзаў Беларусі, створана 14.7.1920, 30.7.1920 рэарганізавана ў Мінскі губернскі савет прафсаюзаў, у лют. 1921 — у Беларускі савет прафесійных саюзаў. На I Усебеларускім з'ездзе прафсаюзаў 7—13.5.1921 замест Белсаўпрофа выбраны Савет прафесійных саюзаў Беларусі (Саўпрафбел), рэарганізаваны 7.2.1924 у Центр. бюро прафсаюзаў Беларусі. У сувязі з узбуйненнем БССР IV Усебеларускі з'езд прафсаюзаў (14—17.6.1924) выбраў Цэнтр. савет прафесійных саюзаў Беларусі (ЦСПСБ), які дзейнічаў да 1937. Пастановай ВЦСПС ад 21.5.1937 функцыі ЦСПСБ перададзены ўпаўнаважанаму ВЦСПС па БССР на грамадскіх асновах. На I Беларускай рэсп. міжсаюзнай канферэнцыі прафсаюзаў у 1948 выбраны Бел. рэсп. савет прафесійных саюзаў (Белсаўпроф), які кваліфікаваў і абагульніў вопыт работы прафс. арг-цый БССР. У 1957 ВЦСПС зацвердзіў Палажэнне пра рэсп., краявы і абл. савет прафсаюзаў, якое расшырыла іх правы, перадала ім прафсаюзны бюджэт, бюджэт дзярж. сац. страхавання і інш.

Белсаўпроф удзельнічае ў распрацоўцы нар.-гасп. планаў рэспублікі, прадстаўляе прафсаюзы ў адпаведных сав. і гасп. органах пры разглядзе пытанняў вытворчасці, працы, зарплаты, культуры і быту рабочых і служачых; вырашае міжсаюзныя пытанні дзейнасці прафарганізацый БССР; разам з сав. і гасп. органамі наладжвае сацыялістычнае спаборніцтва, развівае рух за камуніст. працу, кантралюе выкананне заканадаўства па зарплаце, кіруе рэсп. саветамі навук.-тэхн. т-ва і т-ва вынаходнікаў і рацыяналізатараў, работай прафс. арг-цый па дзярж. сац. страхаванні, санаторна-курортнай справай, турызмам і інш. Наладжвае і падтрымлівае інтэрнац. сувязі з прафс. арг-цыямі заруб. краін. Белсаўпроф на студз. 1970 аб'ядноўваў 24 галіновыя прафесійныя саюзы, з іх 20 мелі рэспубліканскія к-ты (БРК): работнікаў с. гасп. і нарыхтовак; дзярж. гандлю і спажывецкай кааперацыі; асветы, вышэйшай школы і навук. устаноў; буд-ва і прамысловасці буд. матэрыялаў; мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў; машынабудавання; мед. работнікаў; эл. станцый і эл.-тэхн. прамысловасці; лясной, папяровай і дрэваапр. прамысловасці; тэкст. і лёгкай прамысловасці; нафтавай і хім. прамысловасці; харч. прамысловасці; культуры; дзярж. устаноў; авіяработнікаў; геолага-разведвальных работ; марскога і рачнога флоту (г. Гомель); Беларускай чыгункі; аўтамаб. транспарту і шашэйных дарог; сувязі. Белсаўпроф мае 86 абкомаў прафсаюзаў. На 1.1.1970 прафсаюзы Беларусі налічвалі 3 233 599 чл., або 98,2% рабочых, служачых і студэнтаў рэспублікі. Старшыні: Ш. Ш. Ходаш (1920—24), М. Я. Ендакоў (1925—27), І. М. Перапечка (1927—29), І. П. Рыжоў (1929—31), З. З. Кавальчук (1931—37), І. А. *Бельскі* (1945—58), І. М. *Макараў* (1958—70), М. Н. *Полавай* (з 1970).

М. І. Галенчык. Мінск.

БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА. Адкрыўся 8. 4. 1956 спектаклем «Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага. Трупу склалі выпускнікі Бел. дзярж. тэатр.-маст. ін-та і акцёры інш. т-раў. Маст. кіраўнік Л. *Мавалеўская*. У 1960—63 гал. рэж. В. Дакутовіч, у 1965—67 У. Маланкін, з 1967 — Б. Ганага. З першых гадоў т-р стварае свой нац. рэпертуар: «Аркадзь Жыгалкін» Я. Пасава, «Юныя мсціўцы» А. Гутковіча і В. Хазанскага, «Папараць-кветка» і «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела, «Не верце цішыні» і «Дзесі аднаго дома» І. Шамякіна, «За лясамі дрымучымі» А. Вольскага і П. Макаля, «Марат Казей» В. Зуба, «Сярэбраная табакерка» паводле З. Бядулі, «Чырвоны губернатар» У. Мехава, «Цудоўная лодка» В. Вольскага. Значнае месца займаюць спектаклі для моладзі: «У пошуках радасці» і «Няроўны бой» В. Розава, «Учора ў Касаткіне» («Два колеры») А. Зака і І. Кузняцова, «Усё гэта не так проста...» Г. Шмялёва, «Пузыркі» А. Хмеліка, «Горад на світанні» А. Арбузава. Для малодшых гледачоў пастаўлены казкі: «Горад майстроў» Т. Габэ, «Прыгоды Чыпаліна» Дж. Радары, «Прыгоды Буратіна» паводле А. Талстога і інш. З класічных твораў: «Мінулася кату масленіца», «Свае людзі — паладзім» і «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага, «Рэвізор» М. Гогаля, «Клоп» У. Маякоўскага, «Два вераніцы» У. Шэкспіра. Т-р вядзе вялікую работу па ідэйна-маст. выхаванні школьнікаў, гастралірує па рэспубліцы і за яе межамі (іл. гл. на ўклейцы).

Будынак Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача і Палаца піянераў і школьнікаў.



У розны час у т-ры працавалі мастакі: В. Казакоў, В. Кляшчэўскі, А. *Марыкс*, І. Пешкур, А. Тарасаў; рэж. В. *Пачэхін*, кампазітар Я. Глебаў; акцёры: А. Вялюеў, П. Дубашынскі, С. Мацюкевіч, В. Окалаў, К. Пельтцэр, Ю. Флейта. У складзе трупы (1970): засл. артысты БССР В. Барысёнак, У. Говар-Бандарэнка, В. Лебедзеў, Р. Маленчанка, Л. Цімафеева; акцёры Л. Барташэвіч, Л. Бельская, К. Каралёва, К. Мізгайла, Л. Міхайлаў, М. Пятроў, А. Ротар, Г. Ручымскі і інш. Т-р пабудаваны ў Мінску ў 1935—36 (арх. А. Воінаў і У. Вараксін).

РЭПЕРТУАР ТЭАТРА
(у дужках прозвішчы рэжысёра і мастака).

1956 — «Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага (В. Пацехін, П. Масленікаў); «Горад майстроў» Т. Габэ (Л. Мавалеўская, А. Марыкс); «Каханне Ані Бярозкі» У. Пісталенкі (Мавалеўская, Я. Нікалаеў); «Твой шлях» В. Розава (Мавалеўская, В. Кляшчэўскі); «Дзімка-невідзімка» В. Карастылёва і М. Львоўскага (Пацехін, Марыкс); «Мінулася кату масленіца» А. Астроўскага (Мавалеўская, Д. Сычоў); «Па вакліку сэрца» М. Анава і Я. Штэйна (Пацехін, Марыкс). 1957 — «Казка пра сярэбраны сподачак і наліўны яблычак» К. Чарняк і А. Гілодаі (М. Співак, Сычоў); «Тры салаўі, д. 17» Д. Дабрычаніна (Пацехін, Кляшчэўскі); «Аркадзь Жыгалкін» Я. Пасава (Мавалеўская, Кляшчэўскі); «Юныя мсціўцы» А. Гутковіча і В. Хазанскага (Мавалеўская і Пацехін, Сычоў); «Прыгоды Чыпаліна» Дж. Радары (Пацехін, Кляшчэўскі); «Папараць-кветка» І. Козела (Мавалеўская, І. Пешкур). 1958 — «За лясамі дрымучымі» А. Вольскага і П. Макаля (Мавалеўская, Пешкур); «У пошуках радасці» Розава (Мавалеўская, Кляшчэўскі); «Вострая скарбаў» паводле Р. Стывенсана (Пацехін, А. Грыгар'янц); «Восем ліпак і мядзведзіх» І. Юргялевіч (К. Пельтцэр, Кляшчэўскі); «Не верце цішыні» І. Шамякіна (Мавалеўская і Пацехін, Пешкур); «Сябры» В. Зуба і Ю. Багушэвіча (Пельтцэр, Кляшчэўскі). 1959 — «Сёстры» Ф. Кнорэ (А. Вялюеў і Г. Ручымскі, А. Агафоненка); «Учора ў Касаткіне» («Два колеры») А. Зака і І. Кузняцова (Мавалеўская, Кляшчэўскі); «Алавяныя пярсцёнкі» Габэ (Пельтцэр, Кляшчэўскі); «Час любві і нянавісці» Пасава (Мавалеўская, Пешкур). 1960 — «Мякі характар» Л. Гераскінай (Мавалеўская, Пешкур); «Рэвізор» М. Гогаля (Мавалеўская і Л. Бірукова, Кляшчэўскі); «Няроўны бой» Розава (В. Броўкін, Кляшчэўскі); «Квартэт Алямбар» М. Вінніка (Мавалеўская, Пешкур); «Казачны домік» М. Стэгліка (В. Дакутовіч, Кляшчэўскі); «На граніцы» В. Белавёрава (Пацехін, Пешкур). 1961 — «Дапаўненне з вынашкамі» А. Успенскага (Мавалеўская, Кляшчэўскі); «Авадзень» паводле О. Войніч (Пацехін, Кляшчэўскі); «Над хвалямі Серабранкі» Козела (Мавалеўская, Пешкур); «Чырвоныя чарцяняты» П. Вляхіна, А. Палявога і А. Талбузіна (Дакутовіч, Кляшчэўскі); «Зайчык-зазнайчык» С. Міхалкова (Пацехін, Пешкур). 1962 — «Дзе ты, Святлана?» Т. Ян (У. Арлоў, Пешкур); «Клоп» У. Маякоўскага (Дакутовіч, А. Тарасаў); «Том — Вялікае сэрца» С. Багамазава і С. Шатрова (Пацехін, Ю. Тур); «Усё гэта не так проста...» Г. Шмялёва (Пацехін, Пешкур); «Старацелі» А. Пралоўскага (Дакутовіч, Пешкур). 1963 — «Чырвоная шапачка» Я. Шварца (Арлоў і Дакутовіч, Ц. Кіпніс); «Пара любві» В. Катаева (Пацехін, Пешкур); «Вітва ў космасе» М. Гамолкі (Дакутовіч, Тарасаў); «Хлопчыкі з Гаваны» В. Чычкова (Дакутовіч і Пацехін, Пешкур); «Хлапчыш-Кібальчыш» паводле А. Гайдара (П. Малчанаў, Пешкур); «Ганарліўка» Ян (Мавалеўская, Тарасаў). 1964 — «Астапава слава» А. Важэнкі (Л. Міхайлаў, Пешкур); «Два вераніцы» У. Шэкспіра (В. Фёдараў, Тарасаў); «Свае людзі — паладзім» А. Астроўскага (Мавалеўская, Тарасаў); «Дама-невідзімка» П. Кальдэрона (Малчанаў, Пешкур); «Сярэбраная табакерка» паводле З. Бядулі (Я. Батурын, Пешкур); «Марат Казей» Зуба (Н. Ігнатава, Тарасаў); «Любіць — не любіць...» Т. Кажушніка (Малчанаў, Пешкур). 1965 — «Людзі і равабойнікі Кардамона» Т. Эгнера (В. Кісялёў, А. Салаўёў); «Яны і мы» Н. Далініной (Дз. Нікнікоўская, В. Казакоў); «Цуды ў поўдзень» Г. Мамліна (Нікнікоўская, Пешкур); «Пу-

выркі» А. Хмеліка (У. Маланкін, Казакоў). 1966 — «Прыгоды Бураціна» паводле А. Талстога (М. Шыйко, Пешкур); «Мужчына, будзь мужчынамі» М. Матукоўскага (А. Аркадзьеў, Пешкур); «Варшаўскі набат» Карастылёва (Маланкін, Казакоў); «Бумеранг» А. Татарскага (Ніжнікоўская, Пешкур); «Будзьце гатовы, ваша вялікасць!» Л. Касіля і П. Хомскага (Кісялёў і Маланкін, Казакоў). 1967 — «Зорка Венера» М. Алтухова і В. Бур'яна (Маланкін, Казакоў); «Чырвоная шапачка» Шварца (В. Басаў, Пешкур); «Кожнаму сваё» С. Алёшына (Маланкін і Кісялёў, Казакоў); «Чырвоны губернатар» У. Мехава (Маланкін, Казакоў); «Мядовае каралеўства» Л. Усцінава (Кісялёў, Пешкур); «Дзеці аднаго дома» Шамякіна (В. Скарабагатаў, Б. Герлаван). 1968 — «Цудоўная дудка» В. Вольскага (рэж. і мастак А. Грыгар'янц); «Больш не пакідай» П. Тур (Л. Машлянцін, Пешкур); «І зноў сустрэча з маладосцю» А. Арбузава (І. Аляксагін, Казакоў); «Горад на світанні» Арбузава (В. Ганага, Казакоў); «Два клёны» Шварца (В. Данкюнас, Г. Іваніп); «Тры мушкецёры» паводле А. Дзюма (М. Рэхельс, Грыгар'янц). 1969 — «Вялікі канспіратар» А. Кузняцова (Ганага, Казакоў); «Малыш і Карлсан, які жыве на даху» паводле А. Ліндгрэн (Л. Танюк, Ю. Тур); «Агрbalенне апоўначы» М. Мітравіча (Л. Тарасава, В. Тарасаў); «Гэй, ты — здароў!» Мамлінa (Басаў, Пешкур); «Палёт» Мехава (Тарасава, Тарасаў); «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага (Т. Белічэнка, А. Салаўёў); «Неспакойная старасць» Л. Рахманава (Ганага, Герлаван). 1970 — «Адчыніце, казляняткі!» П. Макаля (Тарасава, Тарасаў); «Бялее ветразь адзіноki» В. Катаева (Белічэнка, Тур); «Юнацтва рыцара» В. Зуба (Ганага, Герлаван).

Літ.: Няфёд У. Сучасны беларускі тэатр. Мн., 1961.

С. А. Пятровіч. Мінск.

БЕЛАРУСКІ САВЕЦКІ ТЭАТР. Дзейнічаў у Мінску з 22.12.1918 да сак. 1919. Створаны з калектываў *Першага таварыства беларускай драмы і камедыі*, *«Беларускай хаткі»* і бел. хору (кіраўнік У. *Тэраўскі*). Драм. калектыў узначаліў рэжысёр Ф. *Ждановіч*. Акцёры: У. Галубок, Р. Жакоўскі, А. Крыніца, М. Міцкевіч, Ч. Родзевіч і інш. Рэпертуар: «Раскіданае гняздо» і «Паўлінка» Я. Купалы; «Бязвінная кроў», «Апошняе спаткanne» і «Ганка» Галубка; «Хам» і «Рысь» паводле Э. Ажэшкі; «Модны шляхцюк» К. Каганца; «Кветка папараці» К. Буйло.

Літ.: Нефед В. Становление белорусского советского театра, Мн., 1965, с. 15—23.

БЕЛАРУСКІ СІНАП, селекцыйны беларускі позназімовы сорт яблыні. Вывелі ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы (1930) Э. П. і А. Я. Сюбаравы скрыжаваннем сартоў *Антонаўка звычайная* і Пепін літоўскі. Плады масай 110—130 *г*, авальныя, зелепаватажоўтыя, з дробнаазярністай мякаццю, кіславата-салодкія; ляжаць да чэрвеня. Б. с. марозаўстойлівы і не баіцца грыбковых хвароб. Пачынае пладаносіць на 4—5-ы год пасля пасадкі, на 10—13-м годзе дае 80—120 *кг* пладоў з дрэва. Раяніраваны ва ўсіх зонах БССР. Іл. гл. на ўкл. Сарты яблыні да арт. *Яблыня.*

БЕЛАРУСКІ СЯЛЯНСКІ САЮЗ (БСС), кулацкая нацыяналістычная партыя, якая існавала ў Зах. Беларусі ў 1925—28. Створана ў Вільні групоўкай бел. бурж. нацыяналістаў на чале з В. Рагулем і Ф. Ярэмічам як процівага *Беларускай сялянска-рабочай грамадзе.* У 1926 разам з Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй стварыла *Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры.* Пад націскам рэвалюц. руху, каб пераманіць на свой бок працоўнае сялянства, БСС у сваёй праграме абвяшчаў асобныя бурж.-дэмакр. патрабаванні. Праводзіла палітыку згодніцтва з польскім бурж.-памешчыцкім урадам, змагалася супраць рэвалюц. руху, супраць саюзу рабочых і сялян, за стварэнне бурж. Беларускай рэспублікі. Газ. БСС *«Сялянская ніва»* (Вільня).

БЕЛАРУСКІ ТРАМ (Беларускі дзяржаўны цэнтральны тэатр рабочай моладзі, БДЦТРАМ). Створаны ў Мінску ў 1929 з групы аматараў драм. гуртка клуба «КІМ», у 1937 расфарміраваны. Арганізатар і кіраўнік П. Шамшур. Рэж. М. Гурскі, в 1930 Б. Дольскі. У творчай дзейнасці арыентаваўся на ТРАМы Ленінграда і Масквы.



Сцэна са спектакля «Арыстакраты».

Спачатку рыхтаваў канцэрты, врабіў некалькі ўласных інсцэніровак: «Генеральная лінія» (па творах Дз. Беднага), «Як Мікіта і Панас працаваць ішлі ў калгас», «Плеткафон». Спектаклі: «Першы штандар» (1930, калектыўная п'еса), «Трывога» Ф. Кнорэ (1931), «Новы горад» І. Гурскага (1932). З 1933 наладжана студыйная вучоба акцёраў. У 1934 для т-ра арганізаваны курсы пры Ленінградскім тэатр. тэхнікуме (педагог У. Салаўёў), дзе быў падрыхтаваны «Тарцюф» Мальера. З 1934 маст. кіраўнік М. *Зораў.* Пастаноўкі: «Працяг будзе» (1934) і «Ася» (1936) А. Бруштэйн, «Арыстакраты» М. Пагодзіна (1935), «Музыканцкая каманда» Д. Дэля (1936), «Дон Жуан» («Севільскі спакуснік») Тырса дэ Маліна (1937).

У складзе трупы акцёры: В. Аляксеенка, А. Бараноўскі, В. Брайчэўская, М. Васілеўскі, В. Вашкевіч, С. Глікман, Б. Дакальская, Я. Краўчанка, Г. Лаўроў, Л. Міхайлаў, У. Скакун, У. Стэльмах, С. Фрыд, Л. Яноўская.

Літ.: Аляхновіч М. і Стэльмах У. Беларускі дзяржаўны тэатр рабочай моладзі, «Мастацтва і рэвалюцыя», 1932, № 3—4.

С. А. Пятровіч. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ТРЭЦІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР. Адкрыты 15.8.1920 спектаклем «Суд» У. Галубка ў памяшканні *Беларускага рабочага клуба* ў Мінску. Арганізатар і кіраўнік т-ра У. *Галубок.* У розныя гады называўся: Трупа Галубка (1920—21), Другая бел. дзярж. трупа (1921—26), Бел. дзярж. вандроўны т-р (1926—32), Беларускі трэці дзярж. драм. т-р (БДТ-3, в 1932, з базай у Гомелі). Быў пераважна вандроўны, паказваў спектаклі ў самых аддаленых мясцінах рэспублікі. Нёс у масы бел. нац. культуру, далучаў рабочых і асабліва сялянства









Уверсе: афіша тэатра (злева). Сцэна са спектакля «Суд». Унізе: сцэна са спектакля «Сержант Дроб» (злева). К. Мартыненка ў ролі Ганкі.


да тэатр. мастацтва, вёў асветніцкую і агітац. работу. Спачатку трупа складалася з сям'і і блізкіх Галубка, потым папоўнілася маладымі акцёрамі. Т-р унаследаваў нар. традыцыі *Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага.* У рэпертуары былі пераважна п'есы Галубка. Найб. папулярныя ў 20-я г.: «Ганка» (прайшла 498 разоў), «Пан Сурынта», «Бязвінная кроў», «Суд», «Плытагоны», «Пісараны імяніны», «Пінская мадонна». Спектаклі вызначаліся глыбокай народнасцю, яркім нац. каларытам, былі шчодра насычаны музыкай, песнямі, танцамі. У канцы 20-х і ў 30-я г. запрашаюцца на пастаноўкі рэжысёры: Ф. Ждановіч («Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча, 1929; «Ярасць» Я. Яноўскага, 1930), Міровіч («Даяўчаты нашай краіны» І. Мікітэнкі, 1934; «Гадзіншчык і курыца» І. Качаргі, 1935; «Даходнае месца» А. Астроўскага, 1936), С. Розанаў («Рыкашэт» Галубка, 1934). З канца 1931 мастацкі кіраўнік К. *Саннікаў,* дырэктар Галубок. Асн. месца ў рэпертуары занялі п'есы на сучасныя тэмы: «Контратака» Дз. Курдзіна, «Мой сябар» М. Пагодзіна (1932), «Сержант Дроб» Э. Самуйлёнка (1935), «Мяцеж» паводле Дз. Фурманава (1937).

У рабоце т-ра ўдзельнічалі рэжысёры: А. Дзікі, М. Міцкевіч, І. *Раеўскі.* У складзе трупы акцёры: А. Бараноўскі, В. Вусел, К. Быліч, А. Гарэлаў, У. Далдзюшка, А. Згіроўскі, Т. Шашалевіч, Л. Шынко і інш. У 20-я г. працавалі акцёрамі пісьменнікі: І. Барашка, А. Дудар, В. Сташэўскі, М. Чарот. У 1937 т-р расфарміраваны, акцёры пайшлі ў БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы) і інш. т-ры.

Літ.: Атрошчанка А. Уладзіслаў Галубок, Мн., 1969; Звонак А. Уладзіслаў Галубок, у зб.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967, с. 7—20; Нефед В. Становление белорусского советского театра, Мн., 1965.

А. В. Сабалеўскі. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА (Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа). Створаны з выпускнікоў *Беларускай драматычнай студыі* ў Маскве, адкрыўся ў Віцебску 21.11.1926 спектаклем «У мінулы час» І. Бэна. Да 1945 наз. Беларускі другі дзярж. т-р (БДТ-2). 21.12.1944 прысвоена імя Я. Коласа. У складзе трупы былі акцёры: М. Біліпская, Я. Глебаўская, А. Ільінскі, Р. Кашэльнікава, А. Лагоўская, Л. Мазалеўская, П. Малчанаў, М. Міцкевіч, А. Радаллоўская, К. Саннікаў, С. Станюта, С. Стэльмах, М. Сянько, Ц. Сяргейчык, Я. Чайкоўскі, Л. Шынко і інш. Рэпертуар склалі падрыхтаваныя ў часе вучобы спектаклі: нар. драма «Цар Максіміліян», «Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра, «Астап» А. Глобы і інш. У першых пастаноўках часам выяўлялася празмернае захапленне вонкавай формай. Значных ідэйна-маст. поспехаў дасягнуў т-р у пастаноўцы сучасных твораў, засвойваючы метад сацыяліст. рэалізму. Спектаклі: «Разлом» Б. Лаўранёва, «Рэйкі гудуць» У. Кіршона, «Першая конная» У. Вішнеўскага, «Байцы» Б. Рамашова, «Гібель эскадры» А. Карнейчука. У 30-я гады вызначыліся асн. рысы т-ра: рэвалюц. рамантыка і жыццёвая праўда ў спалучэнні з яркай выразнай формай. Вялікая ўвага ў гэты час аддавалася нац. рэпертуару. Пастаноўкі: «Кавагары» І. Гурскага і «Напор» А. Александровіча, Вечар беларускіх вадэвіляў («Прымакі» і «Паўлінка» Я. Купалы, «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча), «Вайна вайне» і «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі, «Ірынка» К. Чорнага. Ставіў т-р рус. і заруб. класіку: «Беспасажніца» (1936, першая паст. А. Астроўскага на бел. сав. сцэне), «Мяшчане» М. Горкага, «Здані» Г. Ібсена. Першы на Беларусі паставіў гістор.-рэвалюц. п'есы з вобразам У. І. Леніна: «Чалавек з ружжом» (1938) і «Крамлёўскія куранты» (1940) М. Пагодзіна. Этапным стаў спектакль «Несцерка» В. Вольскага — яркае тэатр. відовішча з нар. вобразамі, імклівым рытмам, сакавітымі фарбамі (1941, Дзярж. прэмія СССР 1946). У гады Айч. вайны т-р знаходзіўся ў Уральску, з 1943 у Арэхава-Зуеве. Лепшыя спектаклі таго



Будынак Беларускага тэатра імя Я. Коласа.

часу: «Фронт» Карнейчука, «Нашэсце» Л. Ляонава, «Проба агнём» К. Крапівы, «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага.

У пасляваен. гады гал. месца ў рэпертуары займаюць п'есы на сучасную тэму: «Рускае пытанне» К. Сіманава, «Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага, «Песня нашых сэрцаў» В. Палескага, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка, «Бітва ў дарозе» паводле Г. Нікалаевай, і інш. Сярод твораў заруб. класікі значным дасягненнем стала пастаноўка трагедыі У. Шэкспіра «Гамлет» (1946). Мінуламу бел. народа прысвечаны спектаклі: «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Машэка» В. Вольскага, «Навальніца будзе» па трылогіі Я. Коласа «На ростанях». У 1955 на Дэкадзе бел. мастацтва ў Маскве т-р паказаў свае лепшыя спектаклі: «Несцерка», «Раскіданае гняздо»; «Ворагі» М. Горкага. У 60-я г. поспехі т-ра звязаны з пастаноўкай твораў нац. драматургіі: «Лявоніха» П. Данілава, «Крыніцы» і «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна, «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «Вайна пад стрэхамі» паводле А. Адамовіча; гістор.-рэвалюц. п'ес з вобразам У. І. Леніна — «Імем рэвалюцыі» і «Шостага ліпеня» (Дзярж. прэмія БССР 1968) М. Шатрова; класічных твораў: «Ветрык, вей!» Я. Райніса, «Марыя Сцюарт» Ф. Шылера, «Улада цемры» Л. Талстога.

У развіцці т-ра значную ролю адыгралі рэжысёры В. *Бебутаў*, А. Вільяр, В. *Дарэшаў*, А. *Дзікі*, К. Зубаў, Н. *Лойтар*, Л. *Мазалеўская*, М. *Міцкевіч*, І. *Раеўскі*, С. *Розанаў*, К. *Саннікаў*, А. *Скібневскі*, В. *Тамарын*, В. *Тазаўроўскі*, Ю. *Шчарбакоў*; мастакі А. *Басулаеў*, Г. *Гольц*, Л. Кроль, А. *Марыкс*, Я. *Нікалаеў*, Л. Ніфіцін. У складзе трупы (1970): нар. артысты БССР М. Звездачотаў, А. Радзівілоўская, Ц. Сяргейчык, А. Трус, Ф. Шмакаў, А. Шэлег; засл. артысты БССР Я. Глебаўская, З. Канапелька, У. Куляшоў, Л. Лагоўская, В. Левін, Г. Маркіна, М. Маркоўская, І. Матусевіч, Л. Мацісава, Т. Шашкіна; артысты Г. Дубаў, Т. Кокштыс, А. Мельдзюкова, В. Сяўко, М. Цішачкін і інш. Гал. рэж.— С. Казіміроўскі, гал. мастак — нар. мастак БССР Я. Нікалаеў, мастак У. Салаўёў. Іл. гл. таксама на ўкл.

РЭПЕРТУАР ТЭАТРА
(у дужках прозвішчы рэжысёра і мастака)


1926 — «Цар Максіміліян», нар. драма (В. Смышляеў, Л. Ніфіцін), «Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра (Смышляеў, Ніфіцін); «Апраметная» В. Шашалевіча (Пашкоў, Ніфіцін); «Эрос і Псіхея» Ю. Жулаўскага (Б. Афоніп і М. Міцкевіч, Ніфіцін); «Вакханкі» Еўрыпіда (Смышляеў і К. Саннікаў, В. Матрунін); «У мінулы час» І. Вэна (Афоніп і Міцкевіч, Ніфіцін); «Астап» А. Глобы (В. Громаў і І. Ноўскі, А. Благанраваў). 1927 — Вечар студыйных пастановак: «Гавань» Гі дэ Мапасана, «Цырульнік з Берыягу» М. Мэла (В. Афоніп і А. Гейрат, Ніфіцін і М. Керзін); «Каля тэрасы» М. Грамыкі (С. Марголін, Бразер). 1928 — «Разлом» В. Лаўранёва (С. Розанаў, Г. Гольц і С. Шавалдышава); «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча і «Модны шляхцюк» К. Каганца (рэж. Ц. Сяргейчык); «Калі спяваюць пеўні» Ю. Юр'іна (Міцкевіч, Гольц). 1929 — «Рэйкі гудуць» У. Кіршона (Розанаў і Саннікаў, Гольц); «Маёмасць» па аповесці Г. Караваевай «Двор» (Саннікаў, Л. Якуніна); «Простыя сэрцы» С. Заліцкага, С. Розанава, М. Міцкевіча (Розанаў, В. Хадасевіч). 1930 — «Горад вятроў» Кіршона (Розанаў і Міцкевіч, Гольц); «Авангард» В. Катаева (Розанаў і Саннікаў, Гольц); «Першая конная» У. Вішнеўскага (В. Тазаўроўскі, Матрунін). 1931 — «Качагары» І. Гурскага (Міцкевіч, Гольц); «Напор» А. Александровіча (Міцкевіч, Кісялёў). 1933 — «На захадзе бой» Вішнеўскага (Міцкевіч, Гольц); «Жаніцьба Фігаро» П. А. Бамаршэ (П. Антакольскі і Міцкевіч, Гольц); «Прарыў у каханні» В. Чуркіна (Міцкевіч, І. Ахрэмчык); «Уцехаміранне містэра Рабізона» В. Каверына (Сяргейчык, Шавалдышава). 1934 — «Недарэчнасць» К. Фіна (А. Дзікі, А. Вільяр і Б. Тамарын, А. Басулаеў); «Байцы» Б. Рамашова (В. Дарвішаў, В. Шкляеў); «Цудоўны сплаў» Кіршона (Розанаў, Панкратаў); «Марыя Узорава» М. Трыгера (Сяргейчык); «Гонар» А. Траецкага, Розанава (Розанаў, Ф. Кандратаў); «Чалавек вырашае» Да. Курдзіна (Дарвішаў). 1935 — «Немінучасць» А. Базылеўскага (рэж. Б. Літке); «Гібель эскадры» А. Карнейчука (К. Зубаў, Басулаеў); «Ігра інтарэсаў» Х. Бенавентэ-і-Марціпеса (Г. Ферман, Р. Распопаў). 1936 — «Адважны балазлівец» І. Штока і Смляліна (Сяргейчык, Я. Нікалаеў); «Беспасажніца» А. Астроўскага (Дарвішаў, Басулаеў); Вечар беларускіх вадэвіляў: «Пінская шляхта» Дуніна-Марцінкевіча, «Паўлінка» і «Прымакі» Я. Купалы (П. Малчанаў, Л. Якуніна і Нікалаеў); «Любоў Яравая» К. Транёва (Дарвішаў, Басулаеў). 1937 — «Вайна вайне» Я. Коласа (Дарвішаў, Басулаеў і В. Філіпава); «Дубровскі» паводле А. Пушкіна (Малчанаў, Ніфіцін); «Хаціна дзядзькі Тома» паводле Г. Бічэр-Стоў (З. Вялікі, Нікалаеў); «Банкір» Карнейчука (Дарвішаў, Ніфіцін); «У пушчах Палесся» Я. Коласа (Дарвішаў, Басулаеў); «Вочная стаўка» Л. Шэйніна і бр. Тур (Малчанаў, Нікалаеў). 1938 — «Агні маяка» Л. Карасёва (Вялікі, Нікалаеў); «Дзеці Вапюшына» С. Найдзёнава (Сяргейчык, А. Марыкс); «Мяшчане» М. Горкага (А. Вільяр і Б. Тамарын, А. Арапаў); «Чалавек з ружжом» М. Пагодзіна (Вільяр і Тамарын, Марыкс); «Маё злачынства» Л. Верпёй (К. Зубаў, З. Сірвінт). 1939 — «Цярэнцій Іванавіч» Ю. Свірына (Сяргейчык, Нікалаеў); «Генеральны консул» Шэйніна і бр. Тур (П. Іваноў, Сірвінт); «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка (Малчанаў, Нікалаеў); «Мінулася кату масленіца» А. Астроўскага (Вялікі, Нікалаеў); «Павел Грэкаў» Б. Войцехава і Л. Ленча (Л. Крыцберг, Нікалаеў). 1940 — «Нашы дні» С. Герасімава (С. Казіміроўскі, Нікалаеў); «Над Вяровай-ракой» П. Глебкі (В. Аксёнаў, В. Кісімаў); «Лес» А. Астроўскага (Г. Гарбуноў, Нікалаеў); «Крамлёўскія куранты» Пагодзіна (Аксёнаў, Кісімаў); «Атэстат сталасці» У. Фадора (Сяргейчык, Нікалаеў), «Здані» Г. Ібсена (Гарбуноў, Марыкс); «Лекар паняволі» Мальера (Казіміроўскі, Марыкс). 1941 — «Сентыментальны вальс» А. Літоўскага (Н. Лойтар, А. Фрадкіна і С. Вішнявецкая); «Ірынка» К. Чорнага (Сяргейчык, Б. Малкін); «Несцерка» В. Вольскага (Лойтар, Л. Кроль); «Хлопец з нашага горада» К. Сіманава (Малчанаў, Нікалаеў); «Рыбачка з узбярэжжа» Левіна, «Сурвіяліст» Горава, «Чароўны пірог» Ж. Сезана (Лойтар і Сяргейчык, Нікалаеў); «Сям'я Міхайлавых» У. Салаўёва (Лойтар, Марыкс); «Вясельнае падарожжа» У. Дыхавічнага (Лойтар, Марыкс); «Асада млына» паводле Э. Заля (Лойтар і Сяргейчык, Марыкс); «Крылатае племя» А. Первенцава (Лойтар, Марыкс). 1942 — «Ягор Булычоў



1



2



3



4

Беларускі тэатр імя Якуба Коласа.

Сцэны са спектакляў:


1. «Цар Максімілян» (народная драма). 1926.
2. «Несцерка» В. Вольскага. 1941.
3. «Гамлет» У. Шэкспіра. 1946.
4. «Раскіданае гняздо» Я. Купалы. 1951.
5. «Ворагі» М. Горкага. 1952.
6. «Чалавек з ружжом» М. Пагодзіна. 1938.
7. «Навальніца будзе» па Я. Коласу. 1958.
8. «Шостага ліпеня» М. Шатрова. 1967.



5



6



7




8


1


2


3


4




5


6

Беларускі тэатр оперы і балета II.

Сцэны з балетаў:

1. «Князь-возера» В. Залатарова. 1949.
2. «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага. 1967.
3. «Альпійская балада» Я. Глебава. 1967.
4. «Салавей» М. Крошнера. 1939.
5. «Падстаўная нявеста» Г. Вагнера. 1958.
6. «Спартак» А. Хачатурана. 1964.
7. «Мара» Я. Глебава. 1961.
8. «Выбранніца» Я. Глебава. 1969.


7


8

і іншыя» М. Горкага (Лойтар, Нікалаеў і Марыкс); «Забаўны выпадак» К. Гальдоні (Н. Аноева, Марыкс); «Партызаны ў стэпах Украіны» Карнейчука (Лойтар, Нікалаеў); «Русскія людзі» Сіманава (Лойтар, Нікалаеў); «Пацукалоў» Струева, «Пагоня» Чыкаркова і Залескага, «Укушаны» Ардава, «З цёплым ветрам» В. Пацёмкінай (Аноева, Марыкс і Нікалаеў); «Дзень жывых» А. Бруштэйн (Аноева, Марыкс); «Фронт» Карнейчука (Лойтар, Марыкс). 1943 — «Нашэсце» Л. Ляонава (Міцкевіч, Марыкс); «Той, каго шукалі» А. Расціна і М. Слабадскога (Аноева, Нікалаеў); «Наш карэспандэнт» Л. Левіна і І. Метэра (Аноева, Марыкс); «Проба агнём» К. Крапівы (Лойтар, Марыкс). 1944 — «Плошча кветак» В. Ільенкава (Міцкевіч, Нікалаеў); «Позняе каханне» А. Астроўскага (Лойтар, Нікалаеў); «Заложнікі» Л. Кучара (Міцкевіч, Марыкс і Нікалаеў); «Тэатр Клары Гасуль» П. Мерымэ (Міцкевіч, Марыкс). 1945 — «Так і будзе» Сіманава (Лойтар, Нікалаеў); «Крамлёўскія куранты» Пагодзіна (Міцкевіч, Я. Каваленка і В. Крывашэіна); «Рэвізор» М. Гогаля (Лойтар, Нікалаеў). 1946 — «Каварства і каханне» Ф. Шылера (Самбураў і Мазалеўская, Марыкс); «Начное радыё» бр. Тур і Шэйніна (Малчанаў і Вялікі, Нікалаеў); «Маё кафэ» Т. Бернар (Мазалеўская, Нікалаеў); «Факір па гадзіну» Дыхавічнага і М. Слабадскога (Мазалеўская, Нікалаеў); «Гамлет» У. Шэкспіра (В. Бебутаў, А. Бебутава); «Далёка ад Сталінграда» А. Сурава (Лойтар, В. Кноблак). 1947 — «На белым свеце» П. Ніліна (Лойтар, Кноблак); «Рускае пытанне» Сіманава (Малчанаў, Кноблак); «Глыбокія карэнні» Дж. Гоў і А. Д'Юсы (Давыдаў, Нікалаеў); «Вялікая любоў» Г. Бярозкі (Г. Осіпаў, Кроль). 1948 — «Востраў міру» Я. Пятрова (Осіпаў, Нікалаеў); «Цэнтральны ход» К. Губарэвіча і І. Дорскага (Міцкевіч, Мардуховіч і Нікалаеў); «Вас выклікае Таймыр» К. Ісаева і А. Галіча (Міцкевіч, Нікалаеў); «Авадзень» паводле Э. Войніч (Осіпаў, Нікалаеў); «Вялікая сіла» В. Рамашова (Міцкевіч, Нікалаеў); «Закон Лікурга» («Амерыканская трагедыя») паводле Т. Драйзера (Мазалеўская, Нікалаеў); Вечар вадэвіля: «Віцмундзір» П. Каратыгіна, «Бяда ад пяшчотнага сэрца» У. Салагуба (А. Ільінскі, Нікалаеў); «Нараджэнне свету» паводле А. Талстога (Міцкевіч, М. Гафт); «Аксамітны сезон» Пагодзіна (Мазалеўская, Нікалаеў); «Песня нашых сэрцаў» В. Палескага (Міцкевіч, Нікалаеў). 1949 — «Тайная вайна» Міхайлава і Л. Самойлава (Мазалеўская, Нікалаеў); «Шалёныя грошы» А. Астроўскага (А. Данаці, Нікалаеў); «На тым баку» А. Баранава (Мазалеўская, Нікалаеў); «За вокнамі пасольства» («Асабняк у завулку») бр. Тур (Данаці, Нікалаеў); «Алавянская даліна» Губарэвіча і Дорскага (Міцкевіч, Нікалаеў); «Я хачу дамоў» С. Міхалкова (Мазалеўская, Нікалаеў); «Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабылінa (А. Снібнеўскі, Нікалаеў); «Чужы цень» Сіманава (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Незабыўны 1919-ы» У. Вішнеўскага (Снібнеўскі, Нікалаеў). 1950 — «Свежы вецер» В. Сабко (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Напярэдадні» паводле І. Тургенева (Мазалеўская, Нікалаеў); «Сям'я» І. Папова (Снібнеўскі, Марыкс); «Калі вапнітаюць сады» Палескага (Міцкевіч, Нікалаеў); «Вялікае» Ю. Чапурына (Мазалеўская, Нікалаеў); «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага (Міцкевіч, Нікалаеў); «Каліновы гай» Карнейчука (Міцкевіч, Нікалаеў); «Данчына са збанам» Лопэ дэ Вэгі (Снібнеўскі, Д. Сычоў); «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы (Міцкевіч, Нікалаеў); «Не сябры» В. Розава (Мазалеўская, Нікалаеў). 1951 — «Жывы труп» Л. Талстога (Снібнеўскі, Марыкс); «Іван-да-Мар'я» У. Гольдфельда (Снібнеўскі, Сычоў); «Бітва за жыццё» К. Шатровай і В. Волінай (Мазалеўская, Нікалаеў); «Двайная ігра» Бехцерава і А. Разумоўскага (Міцкевіч, Сычоў); «Тры сястры» А. Чохава (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Жанхіс» М. Такаева (Міцкевіч, Нікалаеў); «На дне» М. Горкага (Снібнеўскі, Сычоў); «Сям'я Алана» Г. Мухтарава (Мазалеўская, Сычоў); «Разлом» (Міцкевіч, Нікалаеў); «Раскіданае гняздо» Я. Купалы (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Атэстат сталасці» Л. Герасімай (Мазалеўская, Сычоў). 1952 — «Нашы станіш танцаў» Лопэ дэ Вэгі (Снібнеўскі, Кроль); «Неспакойныя сэрцы» А. Кучара (Міцкевіч, Нікалаеў); «Пралітая чаша» Вана Шы-фу (Снібнеўскі, Сычоў); «Ворагі» М. Горкага (І. Раеўскі, В. Рындзін); «Простая дзячына» Губарэвіча (Міцкевіч, Нікалаеў). 1953 — «Шторм» У. Вільдэ-Белацаркоўскага (Снібнеўскі, Марыкс); «Трацяя маладосць» бр. Тур (Лойтар, Нікалаеў); «Жорсткі свет» паводле Ч. Дзікенса (Снібнеўскі, Сычоў); «Старонка жыцця» Розава (Лойтар, Нікалаеў); «Васа Жалязнова» М. Горкага (Міцкевіч, Нікалаеў); «Каханне на досвітку» Я. Галана (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Не называючы прозвішча» В. Міцко (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Неблагаслоўлены спадарожнік» А. Салынскага (Лойтар, Нікалаеў). 1954 — «Гаіці» У. Дзюбуа (Міцкевіч, Грыгар'янц); «Ноч памылак» О. Голдсміта (Снібнеўскі, Кроль); «Дачка пракурора» Ю. Яноўскага (Міцкевіч і Снібнеўскі, Грыгар'янц); «Сэрца не дарус» А. Сафронава (Лойтар, М. Кузняцоў і П. Явіч); «Капітан Коршун» Сабко (Лойтар, Нікалаеў); «Машэка» В. Вольскага (Снібнеўскі, Кнаблан); «У бэзавым садзе» Ц. Саладара (Снібнеўскі, Кроль); «Гісторыя аднаго кахання» Сіманава (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Ганна Лучыніна» Транёва (Лойтар, Нікалаеў). 1955 — «Домік на ускраіне» А. Арбузава (Ільінскі і Снібнеўскі, Нікалаеў); «У добры час!» Розава (В. Броўкін, Нікалаеў); «Гарачае сэрца» А. Астроўскага (Лойтар, Кроль); «Гамлет» Шэкспіра (Бебутаў, Бебутава); «Персанальная справа» А. Штэйна (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Андрэй Лабанаў» («Шукальнікі») паводле Д. Граніна (Лойтар, Нікалаеў); «Каханне Ані Бярозкі» У. Пістолекі (Броўкін, Нікалаеў). 1956 — «Крэпасць над Бугам» С. Смірнова (Лойтар, Нікалаеў); «На кругу павароце» Губарэвіча (Снібнеўскі, В. Крывашэіна); «Няшчасны выпадак» М. Маклярскага і Дз. Халендры (Броўкін, Нікалаеў); «Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Шчасце» Дорскага (Лойтар, Нікалаеў); «Дама-невідзімка» П. Кальдэрона (Броўкін, Грыгар'янц); «Родная маці» М. Алтухова (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Цудоўны сплаў» Кіршона (Броўкін, Е. Сафонава); «Платон Крэчат» Карнейчука (Лойтар, Нікалаеў). 1957 — «Адна» С. Алёшына (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Тры салаўі, д. 17» Д. Дабрычаніна (Броўкін, Е. Гранат), «Прыніжаныя і зняважаныя» паводле Ф. Дастаеўскага (Лойтар, Сычоў); «Калі цвіце акацыя» М. Віннікава (Броўкін, Нікалаеў); «Вечная крыніца» Дз. Зорына (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Юныя мсціўцы» А. Гутковіча і В. Хазанскага (Лойтар і Снібнеўскі, Сычоў); «Апошні прыпынак» Э. М. Рэмарка (Броўкін, Гранат); «Святло з Усходу» П. Глебкі (Снібнеўскі, Нікалаеў). 1958 — «У пошуках радасці» Розава (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Людзі і д'яблы» К. Крапівы (Снібнеўскі, Нікалаеў); «Дзімка-невідзімка» В. Карастылёва і М. Львоўскага (Броўкін, Нікалаеў); «Такое каханне» П. Когаўта (Ю. Шчарбакоў, Грыгар'янц); «Лес» (А. Яфрэмаў, Каваленка); «Блудны сын» Э. Ранета (Сяргейчык, Марыкс); «Пачатак жыцця» Фіна (Шчарбакоў, Нікалаеў); «Квадратура круга» Катаева (Броўкін, Нікалаеў); «Навальніца будзе» па трылогіі Я. Коласа «На ростанях» (Шчарбакоў, Нікалаеў); «Тайфун» Цао Юй (Броўкін, В. Іванова). 1959 — «Бітва ў дарозе» паводле Г. Нікалаевай (Шчарбакоў, Нікалаеў); «Сіньёр Марыо піша камедыю» А. Нікалаі (Броўкін, Грыгар'янц); «Квартэт Алямбар» В. Віннікава (В. Браганцаў, А. Тарасаў); «Юстына» Х. Вуаліёкі (І. Багданаў, Нікалаеў); «Уцёкі в ночы» бр. Тур (Браганцаў, Тарасаў); «200 000 на дробныя выдаткі» Дыхавічнага і М. Слабадскога (Шчарбакоў, Нікалаеў). 1960 — «Якарная плошча» І. Штока (Браганцаў, Нікалаеў); «Іркуцкая гісторыя» Арбузава (Шчарбакоў, Нікалаеў і Тарасаў); «Наследнікі Рабурдэна» Э. Заля (А. Вандэрскі, Н. Айзенберг); «Імем рэвалюцыі» М. Шатрова (Браганцаў, Нікалаеў); «Вострая Афрадыты» (Браганцаў, Грыгар'янц); «Сяржант А. Парніса (Ю. Собалеў, Грыгар'янц); «Ляміліцыі» І. Лаўуціна (Браганцаў, Нікалаеў); «Ваніха» П. Данілава (Шчарбакоў, Нікалаеў). 1961 — «Заводская моладзь» І. Шура (Собалеў, Нікалаеў); «Правады белых начэй» В. Паповай (Н. Іванова); «Выгнанне блудніцы» (Н. Уфімцаў, Тарасаў); «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна (Браганцаў, Нікалаеў); «Данчына з васількамі» А. Успенскага (Собалеў, Нікалаеў); «Справа не жыцця» Гутковіча і Ф. Кавоўскай (Собалеў, Нікалаеў); «Крыніцы» паводле І. Шамякіна (Шчарбакоў, Нікалаеў); «Трацяя галава»


М. Эмэ (Собалеў, Грыгар'янц); «Адзін год» паводле Ю. Германа (Браганцаў). 1962 — «Гора баяцца, шчасця не бачыць» С. Маршака (Б. Утораў, К. Андрэеў); «Гульня без правілаў» Л. Шэйніна (Ф. Шмакаў, Нікалаеў); «Ленінградскі праспект» паводле Дастаеўскага (Браганцаў, А. Свішчоў); «Лэдзі і джэнтльмены» Л. Хелман (Собалеў, Нікалаеў); «Пад адным небам» А. Маўзона (Браганцаў і Сяргейчык, Нікалаеў); «Перад вячэрай» Розава (Собалеў, Іванова). 1963 — «Хто Юпітэр» («Яны і мы») Н. Далініна (Ю. Бялоў, Карташоў); «Паварот ключа» М. Кундзеры (Браганцаў, Свішчоў); «Бездакорная рэпутацыя» М. Смірновай і М. Крайндзель (Собалеў, Нікалаеў); «Тэўе-малочнік» Арбузава (Браганцаў, Нікалаеў); «Тэўе-малочнік» паводле Шолам-Алейхема (Ф. Партноў, Нікалаеў); «Гібель эскадры» (Собалеў, Грыгар'янц); «Два клёны» Я. Шварца (В. Міртумаў, Арапаў); «Жывое на свеце жанчына» З. Аграненкі (І. Папоў, Нікалаеў). 1964 — «Ганарліўка» Т. Ян (Собалеў, Іванова і А. Міхайлава); «Вендэта» М. Віннікава (Міртумаў, М. Апёк); «Дачнікі» М. Горкага (Папоў, Нікалаеў); «У дзень вяселля» Розава (Собалеў, Нікалаеў); «Шануй бацьку свайго» В. Лаўрэнцьева (Шмакаў, Нікалаеў); «Пунсовая кветачка» І. Карнаухавай і Л. Браўсевіча (В. Скарабагатаў, Нікалаеў); «Мой бедны Марат» Арбузава (С. Ларыёнаў, А. Кажанкова). 1965 — «Кароль Лір» Шэкспіра (А. Падабед, У. Леферт); «Разбуджанае сумленне» В. Шаўрына (Скарабагатаў, Ю. Назараў); «Праўда і крыўда» паводле М. Стальмаха (Падабед, Нікалаеў); «Дамы і гусары» А. Фрадры (Ларыёнаў, А. Свабода); «Часовы жылец» У. Палякова (Падабед, Нікалаеў); «Ветрык, вей!» Я. Райніса (А. Кродарс, А. Салаўёў); «Беласнежка і сем гномаў» Л. Усціпава і А. Табакова (Дз. Арлоў і В. Анісенка, Салаўёў); «Чатыры крыжы на сонцы» А. Дзялендзіка (Скарабагатаў і Шмакаў, Салаўёў). 1966 — «Гарачае лета ў Берліне» паводле Д. К'юзек (Ю. Коршун, Нікалаеў); «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна (Падабед, Нікалаеў); «Заглянуць у калодзеж» Я. Волчака (В. Каралько, Салаўёў); «У доме на Сонечнай» А. Маўзона (Падабед, Нікалаеў); «Каханне не жарты» Кальдэрона (Скарабагатаў і Каралько, Салаўёў); «Бацькаўшчына» К. Чорнага (Шмакаў, Нікалаеў). 1967 — «Шчыт і меч» паводле В. Кажэўнікава (Каралько, Салаўёў); «Начная аповесць» К. Хаінскага (Казіміроўскі, Салаўёў); «Вайна пад стрэхамі» паводле А. Адамовіча (Шчарбакоў, Нікалаеў); «Шостага лістапада» Шатрова (Казіміроўскі, Нікалаеў); «Захавай маю тайну» Сабко (Шмакаў, Нікалаеў); «Сіняя варона» Р. Пагодзіна (Л. Кавалёў, Салаўёў). 1968 — «Дурнічка» Лопэ дэ Вэгі (Каралько, Салаўёў); «Зыкавы» М. Горкага (Казіміроўскі, Нікалаеў); «Званок у пустую кватэру» Дз. Угрумава (Каралько, Салаўёў); «Варшаўская мелодыя» Л. Зорына (Казіміроўскі, Салаўёў); «Клоп» У. Маякоўскага (Б. Эрын, Салаўёў); «Твой высокі поўдзень» Б. Бур'яна (Казіміроўскі, Нікалаеў). 1969 — «Усім смярцям назло» У. Цітова і К. Міленкі (Кавалёў, Нікалаеў); «Слуга двух гаспадароў» Гальдоні (Казіміроўскі, Салаўёў); «Марыя Сцюарт» Шылера (А. Смелякоў, Салаўёў); «Улада цемры» Л. Талстога (Эрын, Нікалаеў); «Нічога не здарылася» М. Гліндзіна і Г. Рабкіна (Г. Дубаў, Нікалаеў); «Горад без любві» Усціпава (Кавалёў, Салаўёў). 1970 — «Салаўіная ноч» В. Жукова (Казіміроўскі, Салаўёў); «Аднойчы ў навагоднюю ноч» Э. Брагінскага і Э. Разанава (Кавалёў, Салаўёў); «Трацяя патэтычная» М. Пагодзіна (Казіміроўскі, Нікалаеў).

Літ.: Няфёд У. Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі, Мн., 1959; яго ж. Тэатр у вогненныя гады, Мн., 1959; яго ж. Сучасны беларускі тэатр. Мн., 1961; яго ж. Становление белорусского советского театра, Мн., 1965; Сяргейчык Ц. Нататкі акцёра, Мн., 1966; Герасимовіч Э. Всегда в поисках, «Неман», 1966, № 12.

Э. П. Герасімовіч. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ (Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). Адкрыты ў Мінску 14.9.1920 спектаклем «Рысь» (па аповесці «У вімовы вечар» Э. Ажэшкі), а 17.9.1920 была паказана «Паўлінка» Я. Купалы. Заснаваны як Бел. дзярж. т-р, з 1926 наз. Беларускі першы дзярж. т-р (БДТ-1), з 21.12.1944 Бел. т-р імя Я. Купалы. У 1940 узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, у 1955 прысвоена званне акадэмічнага. Першы кіраўнік Ф. *Ждановіч*. У складзе трупы — акцёры *Першага таварыства беларускай драмы і камедыі*, паўпрафесіяналы, аматары. У 1921—31 т-р узначальваў Е. *Міровіч*, які выхаваў выдатных майстроў бел. сцэны, залажыў трывалыя асновы глыбокага рэаліст. мастацтва. У першыя гады ставіліся пераважна фальклорныя і гістар. бел. п'есы: «На купалле» М. Чарота, «Машэка», «Кастусь Каліноўскі» і «Каваль-ваявода» Міровіча. Пастаноўкі вызначаліся яркай тэатральнасцю, народнасцю, шырокім выкарыстаннем этнагр. матэрыялу (рэж. Міровіч). З 2-й пал. 20-х г. асн. ўвага аддаецца сучаснай п'есе: «Кар'ера таварыша Брызгаліна» і «Перамога» Міровіча, «Браняпоезд 14-69» У. Іванава. Рэаліст. пазіцыі т-р замацоўвае значнымі ідэйна-маст. дасягненнямі ў спектаклях пра сацыяліст. рэчаіснасць: «Мост» Я. Рамановіча, «Міжбур'е» Дз. Курдзіна, «Гута» Р. Кобеца. Паглыбленую карціну беларускага нар. жыцця ствараюць спектаклі 30-х г.: «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «Салавей» З. Бядулі, «Партызаны» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка. Выдатнай з'явай маст. жыцця стала пастаноўка сучаснай сатыр. камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» (1939). Ставяцца вядомыя сав. п'есы: «Жыццё кліча» У. Біль-Белацаркоўскага, «Платон Крэчат» А. Карнейчука, «Машачка» А. Афінагенава; класічныя творы: «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага, «Скупы» Мальера. Яркім акцёрскім ансамблем, пераканаўчай сілай вылучаўся спектакль «Апошнія» М. Горкага. У 1941—44 т-р працаваў у Томску. Пастаўлены спектаклі: «Хлопец з нашага горада» і «Рускія людзі» К. Сіманава, «Фронт» Карнейчука, «Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі, «Паўлінка» Я. Купалы (1944, астаецца ўвесь час у рэпертуары т-ра), «Позняе каханне» А. Астроўскага.

Сярод пастановак 40—50-х г. найбольш значныя пра Айч. вайну: «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «З народам» і «Людзі і д'яблы» К. Крапівы, «Гэта было ў Мінску» А. Кучара. Праблемы сучаснага жыцця ўзнімалі спектаклі: «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Макар Дубрава» і «Крылле» Карнейчука, «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка, «На крутым павароце» К. Губарэвіча. Гісторыі рэвалюцыі прысвечаны спектаклі: «Сям'я» І. Папова, «Крамлёўскія куранты» і «Трацяя патэтычная» М. Пагодзіна. Ставіліся класічныя п'есы: «Рамэо і Джульета» У. Шэкспіра, «Дзень цудоўных падманаў» Р. Шэрыдана, «Каварства і каханне» Ф. Шылера, «Таленты і паклоннікі» і «Даходнае месца» А. Астроўскага, «Нора» Г. Ібсена, «Пані міністэрша» Б. Нушыча. З сучасных замежных твораў: «Ліса і вінаград» Г. Фігейрэду, «Забыты ўсімі» Назыма Хікмета.



Першая афіша і будынак Беларускага тэатра імя Я. Купалы.

У 60-я г. пастаўлены: «Лявоніха на арбіце» Макаёнка, «Жывы труп» Л. Талстога, «Дзівак» Назыма Хікмета, «У мяцеліцу» Л. Ляонава, «Я, бабуся, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Р. Лордкіпанідзе, «Выклік багам» А. Дзялендзіка, «Людзі на балоце» паводле І. Мележа, «Традыцыйны абор» В. Розава, «Рудабельская рэспубліка» паводле С. Грахоўскага, «На дне» М. Горкага, «Што той салдат, што гэты» Б. Брэхта, «Апошнія ахвяры» А. Астроўскага. Лепшыя спектаклі т-ра вызначаюцца грамадзянскай страснасцю, стылявым адзінствам, дасканалай сцэнічнай распрацоўкай вобразаў. Т-р шмат гастраліруе па Савецкім Саюзе, быў у Польшчы (1955), удзельнічаў у дэкадах бел. л-ры і мастацтва у Маскве (1940, 1955).

У фарміраванні творчага аблічча т-ра значную ролю адыгралі рэжысёры Ф. Ждановіч, М. *Зораў*, І. *Літвінаў*, Е. *Міровіч*, І. *Раеўскі*, К. *Саннікаў*, Б. *Эрын*, мастакі: А. *Грыгар'янц*, К. Елісееў, Б. Малкін, А. *Марыкс*, І. *Ушакоў*; акцёры В. Галіна, Г. Глебаў, Г. Грыгоніс, І. Ждановіч, У. Крыловіч, К. Міронава, В. Платонаў, В. Пола, Л. Ржацкая, У. Уладамірскі. У розны час у т-ры працавалі акцёры: А. Бараноўскі, Л. Драздова, П. Іваноў, Т. Кіп-Камінскі, В. Краўцоў, Б. Кудраўцаў, Р. Філіпаў, Э. Шапко, Б. Янпольскі. У трупе т-ра (1970): нар. артысты СССР П. Малчанаў, Л. Рахленка, Л. Ржацкая, З. Стома; нар. артысты БССР С. Бірыла, З. Браварская, М. Вялінская, У. Дзялэшка, Р. Кашэльнікава, Г. Макарава, В. Пола, С. Станюта, В. Тарасаў, І. Шаціла, М. Яроменка; засл. артысты БССР Т. Аляксеева, Г. Арлова, Г. Гарбук, Л. Давідовіч, П. Дубашынскі, М. Захаровіч, П. Пекур, А. Рынковіч, М. Федароўскі, С. Хацкевіч, Л. Шынко; артысты Г. Аўсяннікаў, Н. Гейц, В. Дакальская, З. Зубкова, П. Кармунін, У. Кудрэвіч, А. Мілаванаў, У. Рагаўцоў, Г. Талкачова, Б. Уладамірскі і інш. Іл. гл. таксама да ўкл.

РЭПЕРТУАР ТЭАТРА
(у дужках прозвішчы рэжысёра і мастака)

1920 — «Рысь» па аповесці Э. Ажэшкі «У зімовы вечар» (рэж. Ф. Ждановіч); «Паўлінка» Я. Купалы (Ждановіч); «На дне» М. Горкага (рэж. і мастак К. Елісееў). 1921 — «Залёты дзіка» У. Галубка (Ждановіч, Елісееў); «Хам» паводле Ажэшкі (Ждановіч, Елісееў); «Раскіданае гняздо» Я. Купалы (Ждановіч, А. Марыкс); «Міхалка Далецкіх (Ждановіч); «Хата за вёскай» («Цыганка Аза») М. Старыцкага (Ждановіч); «Ганка» Галубка (Ждановіч, Я. Ціхановіч); «Апошняе спатканне» Галубка (Ждановіч); «Вязродныя» Галубка (Ждановіч); «На купалле» М. Чарота (Е. Міровіч, Елісееў); «Дамы і гусары» А. Фрадры (Міровіч); «Вяселле» В. Гарбацэвіча (Міровіч, Елісееў); «На хвалі» (Міровіч); «Чырвоная праўда» А. Вермішава (Ждановіч). 1922 — «Лес шуміць» паводле У. Караленкі (Ждановіч); «Апостал сатаны» («Вучань д'ябла») Б. Шоў (Міровіч, Марыкс); «Жрац Таркініній» С. Паліванава (Міровіч, Марыкс); «Іх чацвёра» Г. Запольскай (Міровіч, Марыкс); «Польскі жыд» Эрмана-Шатрыяна (Міровіч, Марыкс); «Пасланец» Л. Родзевіча (Міровіч, Марыкс). 1923 — «Машэка» Міровіча (Міровіч, Марыкс); «Кат і сын» Міровіча (Міровіч, Марыкс); «Ваўкі» Р. Ралана (Міровіч, Марыкс); «Сацыялістка» Ц. Гартнага (Міровіч, Марыкс); «У ліпнёвую ноч» Б. Гарчынскага (Міровіч, Марыкс); «Кастусь Каліноўскі» Міровіча (Міровіч, Марыкс); «Гімн працы» Андрэенкі (Міровіч, Марыкс); «Чырвоныя кветкі Беларусі» Гарбацэвіча (Міровіч, Марыкс); «Ведзьма» паводле А. Чэхава (Міровіч, Марыкс). 1924 — «Усё добра будзе» («Камяні на дарозе») Я. Раманоўіча (Міровіч, Марыкс); «Мешчанін у дваранах» Мальера (Міровіч, Марыкс); «Пансіі гайдук» Н. Бываеўскага (Міровіч, Марыкс); «Савецкі чорт» Ю. Юр'іна (Міровіч, Марыкс). 1925 — «Чырвоная маска» («Падпальшчыкі») А. Луначарскага (Міровіч, Марыкс); «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча (Міровіч, Марыкс); «Каваль-ваявода» Міровіча (Міровіч, Марыкс); «Вясковы суддзя» П. Кальдэрона (М. Папоў, К. Ціханаў); «Кар'ера таварыша Брызгаліна» Міровіча (Міровіч, Марыкс). 1926 — «Спадчына» М. Патэпэра (Папоў, Марыкс); «Цырымонлівыя паненкі» і «Жорж Дандэн» Мальера (М. Папоў, Ціханаў і Марыкс); «Ноеў каўчэг» і «Шамякаў суд» М. Папова (Папоў); «Перамога» Міровіча (Міровіч, Марыкс); «Вір» Раманоўіча (Міровіч, Марыкс); «Эльга» Г. Гаўптмана, «Зялёны какаду» А. Шніцлера (Папоў, Марыкс); «Стралок Тэль» С. Заяцкага (Міровіч, Марыкс); «Шлюб пад прымусам» Мальера (Папоў, Марыкс); «Скарына — сын з Полацка» М. Грамыкі (Баявецкі). 1927 — «Змрок» В. Шамалевіча (Міровіч, Марыкс); «Над Нёманам» Грамыкі (Міровіч, Ціханаў); «Мяцеж» паводле Дз. Фурманава (Міровіч, Марыкс). 1928 — «Запаюць верацёны» Міровіча (Міровіч, Марыкс); «Браняпоезд 14-69» У. Іванава (А. Вінер і А. Смяляна, В. Волкаў). 1929 — «Крывая аблона» Раманоўіча (Міровіч, Марыкс); «Мост» Раманоўіча (Міровіч, Марыкс); «Інга» А. Глебава (Смяляна, Дз. Крэйн); «Міжбур'е» Дз. Курдзіна (Міровіч, Крэйн); «Месяц алева» У. Біль-Белацаркоўскага (Міровіч); «Шлак» Глебава (рэж. У. Крыловіч і Я. Раманоўіч). 1930 — «Гута» Р. Кобеца (Міровіч, Крэйн); «Лінія агню» М. Нікіціна (Міровіч і Крэйн); «Ярасць» Я. Яноўскага (Смяляна, Крэйн); «Слуга двух гаспадароў» Гальдоні (Міровіч). 1931 — «Справа гонару» І. Мікітэнкі (рэж. А. Крэпуска); «Камяні на дарозе» Раманоўіча (Рахленка, Крэйн). 1932 — «Плацдарм» М. Ірчана (Л. Літвінаў, Крэйн); «Лён» Міровіча (Міровіч і М. Зораў, І. Рабічаў); «Бацькаўшчына» К. Чорнага (Літвінаў, Рабічаў і Дз. Уласюк). 1933 — «Зямля і неба» бр. Тур (Зораў, М. Варпех); «Герой» Раманоўіча (рэж. П. Данілаў); «Мядзведзь» А. Чэхава (Данілаў, Марыкс); «Агаціна ліліпутка» П. Данілава (Данілаў); «Недарасль» Дз. Фанвізіна (Літвінаў і Данілаў, С. Тоўбін). 1934 — «Жакерыя» паводле П. Мерымэ (Літвінаў, М. Аксельрод); «Канец дружбы» К. Крапівы (Літвінаў і Рахленка, Л. Кроль). 1935 — «Жыццё кліча» Біль-Белацаркоўскага (Рахленка, В. Шклярэў); «Сімфонія гневу» Шашалевіча (Літвінаў і Данілаў, С. Вішнявецкая і А. Фрадкіна); «Вялікадушнасць» В. Галаўчынера (Літвінаў, В. Рындзін). 1936 — «Платон Крэчат» А. Карнейчука (Зораў, Марыкс); «Як не вануць» М. Аўуева (Літвінаў, Рындзін); «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага (Рахленка, Марыкс); «Далёкае» А. Афінагенава (Літвінаў, І. Ушакоў); «Сваты» І. Гурскага (Літвінаў, Рахленка, Марыкс); «Капітанская дачка» паводле Пушкіна (Літвінаў, Марыкс); «Апошнія» (Данілаў). 1937 — «Капітанская дачка» паводле А. Пушкіна (Літвінаў, Марыкс);

М. Горкага (І. Раеўскі і М. Зораў, Уласюк); «Скупы» Мальера (Рахленка, Шкляер); «Салавей» З. Бядулі (Рахленка і Літвінаў, Марыкс); «Вочная стаўка» Л. Шэйніна і бр. Тур (Зораў, Шкляер). 1938 — «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага (Рахленка, Шкляер); «Неспакойная старасць» Л. Рахманава (Літвінаў, Марыкс); «Партызаны» К. Крапівы (Рахленка і К. Саннікаў, Б. Малкін); «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча (Зораў, Ушакоў). 1939 — «Падзь Сярэбраная» М. Пагодзіна (Рахленка і С. Бірыла, Малкін); «Генеральны консул» Шэйніна і бр. Тур (Зораў і Рамановіч, Шкляер); «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка (Саннікаў, Ушакоў); «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы (Раеўскі і Рахленка, Шкляер). 1940 — «Дурная для іншых, разумная для сябе» Лопэ дэ Вэгі (В. Галаўчынер, Е. Корніна). 1941 — «Фландрыя» В. Сарду (Рахленка, Ушакоў); «Машачка» Афінагенава (Саннікаў, С. Дабжынскі); «У стэпах Украіны» Карнейчука (Рахленка, Уласюк); «Ірышка» К. Чорнага (Рахленка, Ушакоў); «Хлопец з нашага горада» К. Сімянава (Саннікаў, Ушакоў); «Працяг будзе» А. Бруштэйн (Галаўчынер, З. Сірвінт). 1942 — «Сям'я Мерлье» («Асада млына») паводле Э. Залля (Саннікаў і Л. Кобрынскі, Сірвінт); «Крылатае племя» А. Первенцава (Рахленка, Ушакоў); «Урок жыцця» Галаўчынера (Міровіч, Сірвінт); «Душа Масквы» Л. Нікуліна (Саннікаў, Ушакоў); «Фронт» Карнейчука (Рахленка, Ушакоў). 1943 — «Пётр Крымаў» К. Фіна (Міровіч, Ушакоў); «Рускія людзі» Сімянава (Рахленка, Сірвінт); «Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі (Літвінаў, А. Канстанцінаўскі). 1944 — «Позняе каханне» А. Астроўскага (Літвінаў, Малкін); «Палешукі» Рамановіча (Міровіч, Ушакоў); Вечар камедый: «Паўлінка» і «Прымакі» Я. Купалы (Літвінаў, Малкін); «Таварыш Андрэй» Рамановіча (Літвінаў, Ушакоў). 1945 — «Заложнікі» А. Кучара (Рахленка, Ушакоў); «Мілы чалавек» К. Крапівы (Раеўскі, Малкін). 1946 — «Рамэо і Джульета» У. Шэкспіра (Літвінаў, У. Дзмітрыеў); «Запрацаваны хлеб» А. Астроўскага (Літвінаў, Малкін); «Дрымучае сэрца» Б. Ліпатава (Рахленка, Ушакоў); «Ён прыйшоў» Дж. Прыстлі (Літвінаў, Малкін). 1947 — «За тых, хто ў моры» В. Лаўранёва (Літвінаў, Дзмітрыеў); «Канстанцін Заслонаў» Маўзона (Саннікаў, Ушакоў); «Маладая гвардыя» паводле А. Фадзеева (Літвінаў, Малкін); «Глыбокія карэнні» Дж. Гоў і А. Д'Юсы (Рахленка, Ушакоў). 1948 — «Губернатар правінцыі» Шэйніна і бр. Тур (Саннікаў, Малкін); «Рукапіс прафесара Волкына» Л. Рахленкі (Рахленка і Бірыла, Ушакоў); «З народам» К. Крапівы (Саннікаў, А. Багданаў); «Дзень цудоўных падманаў» («Дуэнья») Р. Шэрыдана (Літвінаў, Ушакоў); «Маскоўскі характар» А. Сафронава (Саннікаў, Ушакоў). 1949 — «Гэта было ў Мінску» А. Кучара (Літвінаў, Ушакоў); «Змова асуджаных» М. Вірты (Літвінаў, Ушакоў); Канцэрт з твораў А. Пушкіна: «Барыс Гадуноў» (сцэны з трагедыі — «Келля», «Карчма», «Каля фантана») і «Скупы рыцар» (Бірыла і В. Краўцоў, Ушакоў); «Асабняк у завулку» бр. Тур (Саннікаў і Б. Платонаў, Багданаў); «Чужы цень» Сімянава (Літвінаў, Марыкс); «Цудоўны скарб» П. Малярэўскага (Рахленка, П. Масленікаў); «Цытадэль славы» К. Губарэвіча (Саннікаў, Ушакоў). 1950 — «Голас Амерыкі» Лаўранёва (Літвінаў, Ушакоў); «Таленты і паклоннікі» А. Астроўскага (Літвінаў, Ушакоў); «Сям'я» І. Папова (Саннікаў і В. Галіна, М. Гафт); «Калінавы гай» Карнейчука (П. Сушко, Ушакоў); «Плюшь жаваранкі» К. Крапівы (Саннікаў, Ушакоў і В. Хашкоўскі); «Сям'я Лутоніных» бр. Тур і І. Пыр'ева (Саннікаў, Хашкоўскі). 1951 — «Вішнёвы сад» А. Чэхава (М. Міцкевіч, Ушакоў); «Уцёкі» Дз. Шчаглова (У. Кухта і Бірыла, Хашкоўскі); «Ганна Карэніна» паводле Л. Талстога (Саннікаў, Ушакоў); «Жаніцьба Бальзамінава» А. Астроўскага (Т. Гагава, Ушакоў). 1952 — «На досвітку» А. Макаёнка (Саннікаў і Кухта, Ушакоў); «Макар Дубрава» Карнейчука (Л. Мазалеўская, Ушакоў); «Прага застаецца маёй» Ю. Бураковскага (Кухта, Ушакоў); «Залп «Ауроры» М. Бальшынцова і М. Чыгрэлі (І. Судакоў, Ушакоў); «Шчасце паэта» В. Віткі (Сушко і Судакоў, Масленікаў); «Пупсовая кветачка» І. Карнаўхавай і Л. Браўсевіча (І. Ждановіч, М. Бліцч); «Гібель Пампеева» Вірты (Мазалеўская, Ушакоў). 1953 — «Зацікаўленая асоба» К. Крапівы (Саннікаў, Ушакоў); «Простая дзяўчына» Губарэвіча (Саннікаў і Сушко, Хашкоўскі); «Даходнае месца» А. Астроўскага (Мазалеўская, Д. Сычоў); «Кавярства і каханне» Ф. Шылера (Рахленка, А. Грыгар'янц). 1954 — «Нора» Г. Ібсена (А. Маркава, Грыгар'янц); «Выбачайце, калі ласка!» Макаёнка (Саннікаў, Ушакоў); «Вогненны мост» В. Рамашова (Рахленка, Грыгар'янц); «Дачка пракурора» Ю. Яноўскага (В. Ганкебуш, Хашкоўскі); «Чайка» А. Чэхава (Мазалеўская, І. Пісараў); «Пінская шляхта» (Саннікаў, Масленікаў). 1955 — «Крылле» Карнейчука (Рахленка, Л. Файленбоген); «Ілгун» Гальдоні (Дз. Арлоў, Файленбоген); «У добры час!» В. Розава (Мазалеўская, Я. Нікалаеў); «Зыкавы» М. Горкага (Саннікаў, А. Мацвееў); «У ціхім завулку» А. Маўзона (Рахленка, Файленбоген). 1956 — «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна (Рахленка, Файленбоген); «На крутым павароце» Губарэвіча (Саннікаў, Нікалаеў); «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага (М. Архангельскі, М. Плахава); «Таня» А. Арбузава (Жданоўскі, Плахава); «Салавей» З. Бядулі (Рахленка, Грыгар'янц); «Пані міністэрша» В. Нушыча (Рахленка, Малкін). 1957 — «Дамы і гусары» (Архангельскі, Ц. Кіпніс); «Шлюб па сакрэту» Дж. Колмена-старайшага і Д. Гарыка (Саннікаў, Грыгар'янц); «Пакуль вы маладыя» І. Мележа (Мазалеўская, В. Грубін); «Вечная крыніца» Дз. Зорына (Саннікаў, Мацвеў); «Ліса і вінаград» Г. Фігейроду (В. Эрын, Волкаў); «Навальнічны год» А. Каплера (Рахленка, Файленбоген); «Праз 20 гадоў» М. Святлова (Ждановіч, Грыгар'янц). 1958 — «Забыты ўсімі» Назыма Хікмета (Эрын, Грыгар'янц); «Людзі і д'яблы» К. Крапівы (Саннікаў, Грыгар'янц); «Дні нашага нараджэння» Мележа (Я. Простаў, В. Галубовіч). 1959 — «Трацяя патэтычная» Пагодзіна (Эрын, Грыгар'янц); «Каб людзі не журыліся» Макаёнка (Простаў, Файленбоген і Галубовіч); «Смерць ваяводы» Ю. Славацкага (Саннікаў, Галубовіч); «Дабракі» Л. Зорына (Эрын, Грыгар'янц); «Уцёкі з ночы» бр. Тур (Рахленка, Галубовіч). 1960 — «Мільён за ўсмешку» Сафронава (З. Браварская, Грыгар'янц); «Уваскрэсенне» паводле Л. Талстога (А. Яфрэмаў, Галубовіч); «Злавацца не трэба» В. Зуба (Саннікаў, Галубовіч); «Востраў Афрадыты» А. Парыса (Рахленка, Малкін); «Выбух» І. Дварэцкага (А. Лебедзеў, Грыгар'янц); «Веру ў цябе» В. Карастылёва (В. Броўкін, Галубовіч). 1961 — «Твой светлы шлях» А. Маўзона (Рахленка, І. Новікаў і У. Гардзеенка); «Лявоніха на арбіце» Макаёнка (Эрын, Волкаў); «Трэцце жаданне» Б. Блажака (Броўкін, К. Андрэеў); «Любоў, Надзея, Вера» П. Васілеўскага (Саннікаў, Галубовіч); «Гаспадар» І. Собалева (Броўкін, Нікалаеў); «Жывы труп» Л. Талстога (І. Папоў, Нікалаеў). 1962 — «Паўночная мадонна» Бр. Тур (Рахленка, Грыгар'янц); «Чацвёрты» Сімянава (Эрын, Грыгар'янц); «Тысяча франкаў узнагароды» В. Гюго (Броўкін, В. Заборац); «На ўсякага мудраца хапае прастаты» А. Астроўскага (Эрын, Волкаў); «Зубчыя пяскі» П. Хайноўскага (Рахленка, Гардзеенка і Б. Герлаван); «Перад вячэрай» Розава (М. Тэр-Захарава, Л. Батурын). 1963 — «Першая старонка» Н. Івантар (Ю. Шчарбакоў, Грыгар'янц); «Футбол» П. Кантэна і Дж. Белака (Л. Відаўскі, Грыгар'янц); «Сябры і гады» Л. Зорына (Шчарбакоў, Грыгар'янц); «Палата» С. Алёшына (Эрын, Грыгар'янц); «Ноч памылак» О. Голдсміта (У. Маланкін, М. Кітаеў); «Жаніцьба Білугіна» А. Астроўскага і М. Салаўёва (Громаў, Герлаван); «Рускія людзі» (Шчарбакоў, Грыгар'янц). 1964 — «Мяцеж невядомых» Г. Баравіка (Рахленка, Грыгар'янц); «Воўка на планеце Ялмез» Карастылёва (В. Брэеў, Андрэеў); «Канец — справе вянец» Шэкспіра (Шчарбакоў, А. Танец — справе вянец» Шэкспіра (Шчарбакоў, А. Танец — справе вянец» Шэкспіра (Шчарбакоў, А. Тан

І. Дзяржынскага (А. Ратнер, М. Смоліч, Н. Каровіч); «Царская нявеста» (Н. Грубін, Рапапорт, Віш); «Царская нявеста» (Н. Грубін, Рапапорт, Віш); «Марная засцярога» П. Л. Герс. Нікалаеў). Балет «Марная засцярога» (1-я тэля (М. Балавоўскі, К. Мулер, Каровіч). 1939 — Оперы: «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага (1-я рад.— Шнейдэрман, Л. Літвінаў, В. Матрунін; 2-я — Шнейдэрман, Златагораў, В. Волкаў); «У пушчах Палесся» А. Багатырова (Грубін, І. Шляпянаў, Нікалаеў). Балеты: «Салавей» М. Крошнера (Шнейдэрман, А. Ермалаеў і Лапухоў, Матрунін); «Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева (Балазоўскі, К. Галяйзоўскі, Каровіч). 1940 — Оперы: «Кветка шчасця» А. Туранкова (Грубін, Шляпянаў, Л. Кроль); «Яўген Анегін» (Балазоўскі, Златагораў); «Чыо-Чыо-сан» Пучыні (Шнейдэрман, Златагораў, Нікалаеў); «Трыльбі» А. Юрасоўскага (Грубін, Барысевіч, Нікалаеў). 1941 — Оперы: «Травіята» Вердзі (Шнейдэрман, Шляпянаў, Матрунін); «Пікавая дама» (Грубін, У. Шахрай, Нікалаеў); «Казкі Гофмана» Ж. Офенбаха (Грубін, Барысевіч, Матрунін). Балет «Дон Кіхот» Л. Мінкуса (Балазоўскі, Мулер, Матрунін). 1942 — «Купальская ноч» — мантаж з опер «Міхась Падгорны», «Кветка шчасця» і балета «Салавей» (балетмайстры Ермалаеў і Ю. Хіраска). 1943 — Опера «Чыо-Чыо-сан» (Шнейдэрман, Шахрай). 1944 — Оперы: «Севільскі цырульнік» (Шнейдэрман, Шахрай, А. Варгін); «Алеся» Цікоцкага (А. Брон, Б. Пакроўскі, Нікалаеў). Балет «Марная засцярога» (Р. Сталяроў, З. Васільева). 1945 — Оперы: «Кармэн» (Брон, Пакроўскі, Нікалаеў); «Чыо-Чыо-сан» (Шнейдэрман, Барысевіч, Нікалаеў); «Севільскі цырульнік» (Шнейдэрман, Шахрай, П. Прусакоў). Балет «Арлекінада» Р. Дрыга (Т. Каламійцава, В. Вайнанен, В. Хадасевіч). 1946 — Оперы: «Травіята» (Брон, Шахрай, Нікалаеў); «Русалка» (Шнейдэрман, Барысевіч, Волкаў). Балет «Дон Кіхот» (Пятроў, Мулер, Марыкс). 1947 — Опера «Кастусь Каліноўскі» Дз. Лукаса (Брон, Мардвінаў, Нікалаеў). 1948 — Оперы: «Яўген Анегін» (Гіттарц, Шахрай, Волкаў); «Пікавая дама» (У. Пірадаў, Мардвінаў, Нікалаеў); «Рыгалета» (Брон, Мардвінаў, Нікалаеў); «Дубровскі» Э. Напраўніка (Д. Карасік, Шахрай, Нікалаеў). Балет «Лебядзіное возера» (А. Жаленц, Мулер, Нікалаеў). 1949 — Оперы: «Князь Ігар» (Пірадаў, Мардвінаў, Нікалаеў); «Прададзеная нявеста» Б. Сметаны (Пірадаў, Мардвінаў, П. Масленікаў); «Чаравічкі» Чайкоўскага (Гіттарц, Шахрай, Нікалаеў); «Алека» С. Рахманінава (Пірадаў, Шахрай, М. Бліш); «Травіята» (Жаленц, Шахрай, Нікалаеў). Балеты: «Бахчысарайскі фантан» (Жаленц, Мулер, Масленікаў); «Канёк-Гарбунок» (Жаленц, Мулер, Нікалаеў); «Іспанскае капрычыо» на муз. Рымскага-Корсакава (Пірадаў, С. Дрэчын, Бліш); «Князь-возера» В. Залатарова (Гіттарц, Мулер, Нікалаеў). 1950 — Оперы: «Царская нявеста» (Л. Худалей, Шахрай, Нікалаеў); «Іван Сусанін» М. Глінкі (Пірадаў, Мардвінаў, Нікалаеў); «Тоска» (Пірадаў, Шахрай, Масленікаў); «Фаўст» Ш. Гуно (Каламійцава, Шахрай, Нікалаеў). Балеты: «Чырвоны мак» (Жаленц, Дрэчын, Масленікаў); «Салавей» (Гіттарц, Мулер, Масленікаў). 1951 — Оперы: «Палацы» Р. Леанкавала (У. Карпаў, Шахрай, Масленікаў); «Марозка» М. Красева (Худалей, Мардвінаў, Нікалаеў); «Ціхі Дон» (Худалей, Мардвінаў, Нікалаеў); «Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Артямоўскага (Худалей, Л. Александроўская, Масленікаў); «Дэман» А. Рубінштэйна (Карасік, Шахрай, Масленікаў). Балеты: «Доктар Айбаліт» І. Марозава (Карасік, Мулер, Бліш); «Эсмеральда» Пуні (С. Абраміс, Дрэчын, Нікалаеў). 1952 — Оперы: «Таланта» (В. Афанасьеў, А. Маралёў, Масленікаў) і «Мавена» (Л. Любімаў, Александроўская, Нікалаеў) П. Чайкоўскага; «Страшны двор» С. Манюшкі (Любімаў, Александроўская, Масленікаў); «Лакме» Далібэ (Абраміс, Маралёў, Масленікаў). Балетная сюіта «Шапэніяна» (Каламійцава, Дрэчын, Масленікаў). 1953 — Оперы: «Аіда» Вердзі (Любімаў, Александроўская, Нікалаеў); «Дзяўчына з Палесся» Цікоцкага (Любімаў, Александроўская, Нікалаеў); «Маладая гвардыя» Ю. Мейтуса (Каламійцава, Маралёў, Масленікаў). Балеты: «Аповесць пра каханне» Залатарова (Каламійцава, Ермалаеў, Нікалаеў); «Жызэль» А. Адана (Каламійцава, Мулер, Бліш). 1954 — Оперы: «Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага (Любімаў, Александроўская, Нікалаеў); «Яўген Анегін» (Каламійцава, Маралёў, У. Мамантаў). Балет «Спячая красуня» Чайкоўскага (Абраміс, Мулер, Нікалаеў). 1955 — Оперы: «Марыка» Р. Пукста (Абраміс, Маралёў, Бліш); «Трубадур» Вердзі (Любімаў, Александроўская, У. Кульваноўскі); «Русалка» (Любімаў, Александроўская, І. Пешкур); «Фра-Д'ябала» Ф. Абера (Каламійцава, Маралёў, Масленікаў). Балеты: «Палымяныя сэрцы» Залатарова (Каламійцава, Ермалаеў, Нікалаеў); «Лаўрансія» А. Крэйна (Абраміс, Дрэчын, Бліш). 1956 — Оперы: «Шукальнікі жэмчугу» Бізэ (Абраміс, Ю. Ужанцаў, Кульваноўскі); «Надзея Дурава» Багатырова (Любімаў, Александроўская, Нікалаеў). Балет «Шчаўкунок» Чайкоўскага (Каламійцава, Мулер, Пешкур). 1957 — Оперы: «Садко» Рымскага-Корсакава (Любімаў, Маралёў, Нікалаеў); «Міхась Падгорны» (Брон, Александроўская, Масленікаў). Балет «Карсар» Адана (Абраміс, Дрэчын, Масленікаў). 1958 — Оперы: «Яснае світанне» Туранкова (Любімаў, Александроўская, Масленікаў); «Чараўзейка» Чайкоўскага (Любімаў, Маралёў, Нікалаеў); «Манон» Ж. Маснэ (Абраміс, Ужанцаў, Кульваноўскі). Балеты: «Блакітны Дунай» на муз. І. Штраўса (Каламійцава, Дрэчын, Мамантаў); «Падстаўная нявеста» Г. Вагнера (Каламійцава, Мулер, Кульваноўскі). 1959 — Оперы: «Вертэр» Маснэ (Абраміс, Ужанцаў, М. Чэпік); «Дзіця радасці» К. Карчмарова (Любімаў, Маралёў, Волкаў); аперэта «Карнавальскія званы» Р. Планкета (Любімаў, Ужанцаў, Мядзведзеў). Балеты: «Марная засцярога» (Каламійцава, Мулер, П. Калейнік); «Баядэрка» Мінкуса (Абраміс, Ю. Дружынін, Масленікаў). 1960 — Оперы: «Пікавая дама» (Каламійцава, Александроўская, Я. Чамадураў); «Калючая ружа» Ю. Семяняк (Любімаў, Ужанцаў і В. Броўкін, Чамадураў); аперэта «Цыганскі барон» Штраўса (Абраміс, Ужанцаў, Масленікаў). Балет «Сцежкаю грому» К. Караева (Каламійцава, Н. Канюс, Масленікаў). 1961 — Оперы: «Бал-маскарад» Вердзі (Абраміс, М. Валянцінаў, Масленікаў); «Церам-церамок» І. Польскага (Любімаў, Ужанцаў, Кульваноўскі); аперэта «Літучая мыш» Штраўса (Каламійцава, Броўкін, Чамадураў). Балеты: «Казка пра мёртвую парэўну і сем асілкаў» У. Дзешавова на тэмы А. Лядава (Абраміс, А. Андрэеў, Чамадураў); «Мара» Я. Глебава (Любімаў, Андрэеў, Чамадураў). 1962 — Оперы: «Заручыны ў манастыры» С. Пракоф'ева (Каламійцава, Дз. Смоліч, Чамадураў); «Джаконда» А. Панк'елі (Абраміс, Смоліч, Масленікаў); «Кето і Катэ» В. Далідзэ (Каламійцава, Смоліч і Ужанцаў, Кульваноўскі). Балет «Дон Кіхот» (Абраміс, Андрэеў, Чамадураў). 1963 — Оперы: «Атэла» Вердзі (Абраміс, Смоліч, А. Дулеўскі); «Рафаэль» А. Арэнскага (Каламійцава, Ужанцаў, Дулеўскі); «Арэстэя» С. Танеева (Каламійцава, Смоліч, Чамадураў); «Яснае світанне» (Любімаў, Смоліч, Чамадураў). Балеты: «Святло і цені» Г. Вагнера (Любімаў, Андрэеў, Чамадураў); «Трыстан і Ізольда» на муз. Р. Вагнера (Каламійцава, Н. Стуколіна, Дулеўскі); «Балеро» на муз. М. Раведя (Каламійцава, Стуколіна і Андрэеў, Чамадураў). 1964 — Опера «Трубадур» (Каламійцава, Ужанцаў, Кульваноўскі). Балет «Спартак» А. Хачатурана (Абраміс, А. Дадышкіліяні, Дулеўскі). 1965 — Оперы: «Любоўны напітак» Г. Даніцэці (Каламійцава, Ужанцаў, Дулеўскі); «Кастрычнік» В. Мурадэлі (Абраміс, Смоліч, Чамадураў). Балет «Золушка» Пракоф'ева (Каламійцава, Р. Захараў, Чамадураў). 1966 — Балет «Пер Гюнт» на муз. Э. Грыга (Каламійцава, Дадышкіліяні, Чамадураў). 1967 — Оперы «Брэсцкая крэпасць» К. Малчанава (Г. Дугашаў, Смоліч, Чамадураў); «Алеся» (Каламійцава, Смоліч, Чамадураў). Балеты: «Альпійская балада» Глебава (Дугашаў, Дадышкіліяні, Чамадураў); «Лебядзіное возера» (Каламійцава, А. Месэрэр, Чамадураў). 1968 — Оперы: «Багема» Пучыні (Каламійцава, Смоліч, А. Грыгар'янц); «Калі ападае лісце» Семяняк (Абраміс, Смоліч, Чамадураў). Балет «Рамэо і Джульета» Пракоф'ева (Дугашаў, Дадышкіліяні, Чамадураў). 1969 — Оперы: «Травіята» (К. Ціханаў, Смоліч, А. Краўчук); «Тоска» (Абраміс, У. Станкевіч, Масленікаў). Балет «Выбранніца» Глебава (Каламійцава, Дадышкіліяні, Чамадураў). 1970 — Оперы: «Хаваншчына» М. Мусаргскага (Ціханаў, Дадышкіліяні, Чамадураў); «Андрэй Касценя» М. Аладава (Ціханаў, Маралёў і Ужанцаў, Чамадураў).

Літ.: Смольский В. С. Белорусский музыкальный театр, Мн., 1963; Чурко Ю. Белорусский балет, Мн., 1966. *Б. С. Смольскі.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА імя Н. К. Крупскай, створаны ў Мінску ў 1931 в удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Арганізатар і рэж. М. *Кавязін.* З пастановак: «Наш» М. Зныка (1932), «Вінтоўка № 492116» А. Крона (1933), «Адвакат Патлен» (1934), «Мікола Гоман» В. Сташэўскага (1936), «Казка пра цара Салтана» паводле А. Пушкіна (1937). У 1937 т-р рэарганізаваны. Папоўніўся выпускнікамі *Беларускай студыі* пры цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе і інш. Маст. кіраўніцтва ўзначаліў Е. *Міровіч,* рэж. Ю. Палічынецкі. Акцёры: Л. Абакун, П. Басінкевіч, С. Болітар, В. Брайчэўская, Л. Буцько, Ю. Гальперына, С. Гурвіч, М. Заборскал, В. Ігнацьеў, А. Кашына, В. Окалаў, А. Ротар, У. Стэльмах, Л. Фрыдман, М. Цурбакоў, В. Чамялоў і інш. Лепшыя спектаклі: «Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага (1937), «Ноч у верасні» І. Чэкіна (1938), «Блакітнае і ружовае» А. Брушгэйн, «Цудоўная дудка» В. Вольскага, «Снежная каралева» Я. Шварца (усе ў 1939), «Даходнае месца» А. Астроўскага і «Хітрыкі Скапэна» Мальера (1940). З пач. Вял. Айч. вайны т-р сышоў дзейнасць.

Літ.: Тэатр юнага гледача БССР імя Н. К. Крупскай. Мн., 1940.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІ ІНСТЫТУТ, заснаваны ў 1945 у Мінску. Да 1953 наз. Беларускі тэатральны ін-т, рыхтаваў толькі акцёраў драм. т-раў. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: акцёрскі і мастацкі. Спецыяльнасці: акцёр драм. т-ра і кіно; рэжысёр прафесійных і нар. тэатраў; жывапіс; скульптура; графіка; манумент.-дэкар. мастацтва; прамысл. мастацтва; дэкар.-прыкладное мастацтва (мадэліраванне вырабаў тэкст. і лёгкай прамысловасці, інтэр'ер і абсталяванне, керамікі і шкло); культ.-асвет. работа; тэатразнаўства і мастацтвазнаўства. Есць вячэрняе і завочнае аддзяленні. Аспірантура з 1969.

У стварэнні ін-та і яго ф-таў удзельнічалі нар. артысты БССР: Е. А. Міровіч (маст. кіраўнік ін-та з 1952), К. М. Саннікаў і Дз. А. Арлоў; засл. арт. РСФСР Б. А. Мардвінаў, нар. мастакі БССР А. А. Вембель і В. В. Волкаў, д-р мастацтвазнаўства У. І. Няфёд, якія сталі і першымі яго выкладчыкамі. У ін-це працавалі нар. арт. СССР В. В. Платонаў, нар. арт. БССР В. У. Галіна, І. Ф. Ждановіч, засл. дз. маст. БССР Л. І. Мазалеўская і інш. майстры бел. мастацтва. У ін-це працуюць (1970): прафесары І. В. Ахрэмчык, А. А. Вембель, В. П. Рэлліх, У. І. Няфёд, засл. дзеячы мастацтва БССР Н. М. Воранаў, П. В. Масленікаў, У. П. Сухаверхаў, засл. арх. БССР В. І. Гусеў і інш. Рэктар (з 1968) канд. мастацтвазнаўства Э. П. Герасімовіч. У 1958 выдадзены аб. навук. прац (в. 1). *Э. П. Герасімовіч.* Мінск.

БЕЛАРУСКІ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ імя С. М. Кірава, заснаваны ў 1930 у Гомелі як лесатэхнічны інстытут (на базе факультэта лясной гаспадаркі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі). З 1945 у Мінску; у 1961 пераўтвораны ў тэхналаг. ін-т.



Навучальны корпус Беларускага тэхналагічнага інстытута.

Рыхтуе спецыялістаў па лесаінжынернай справе, машынах і механізмах лясной і драваапр. прамысловасці, лясной гасп., тэхналогіі дрэваапрацоўкі, машынах і апаратах хім. вытворчасці, хім. тэхналогіі драўніны, хім. тэхналогіі цэлюлозна-папяровай вытворчасці, тэхналогіі неарган. рэчываў і хім. угнаенняў, хім. тэхналогіі перапрацоўкі нафты і газу, тэхналогіі гумы, хім. тэхналогіі пластмас і інш. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: механічнай тэхналогіі драўніны, лесаінжынерны, лесагаспадарчы, хім. тэхналогіі і тэхнікі, тэхналогіі арган. рэчываў, завочны. Філіял у Наваполацку, 8 н.-д. лабараторый. Аспірантура з 1949. У 1969/70 навуч. г. займалася 5800 студэнтаў.

Значны ўклад у развіццё ін-та зрабілі бел. вучоныя В. І. Пераход, К. М. Караткоў, І. Д. Юркевіч, М. І. Арленка, А. Л. Бярнадскі, В. К. Захараў і інш. У 1970 на 46 кафедрах 412 выкладчыкаў, у т. л. 12 праф. і д-роў н., 136 дацэнтаў і канд. н. Прафесары і д-ры навук: Ф. Г. Асіпенка, М. А. Бапрафесары і д-ры навук: Ф. Г. Асіпенка, М. А. Бацін, С. Х. Будыка, В. Дз. Жылкін, М. І. Касцюкевіч, К. Ф. Міран, Г. І. Новікаў, У. В. Пячкоўскі, П. П. Рагавой, П. М. Трафімаў, А. Ф. Ціханаў. Рэктар д-р с.-г. н. праф. В. Я. Віхроў (з 1960).

Асн. навук. даследаванні: павышэнне прадукцыйнасці лясоў Беларусі і паляпшэнне выкарыстання лясных зямель, распрацоўка сістэм машын і пытанняў комплекснай механізацыі лесанарыхтоўчых работ, комплекснае выкарыстанне драўніны і ўдасканальванне тэхналогіі дрэваапрацоўкі, тэарэт. асновы хіміі і хім. тэхналогіі вытворчасці арган. і неарган. рэчываў, распрацоўка і ўдасканальванне тэхнікі хім. вытворчасці. Ін-т

Будынак Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.



прымае да абароны доктарскія і канд. дысертацыі па тэхн. навуках.

Літ.: 25 лет Белорусского лесотехнического института имени С. М. Кирова. 1930—1955, Мн., 1957.

А. Д. Янушка. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ ДРУГІ, фронт у Вял. Айч. вайну 1941—45. Утвораны рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання 17.2.1944. Камандуючы ген.-палк. П. А. Курачкін, чл. Ваеннага Савета ген.-л. Ф. Я. Бокаў, нач. штаба ген.-л. У. Я. Калпакчы. У склад фронту ўвайшлі 61-я армія (ген.-л. П. А. Белоў), 47-я (ген.-л. М. І. Гусеў), 70-я (ген.-л. В. С. Папоў), 6-я паветраная (ген.-л. Ф. П. Палынін) і 77-ы стралковы корпус. 17.3.1944 войскі фронту пачалі наступаць на ковельскім напрамку, прайшлі на захад па 50—70 *км*, акружылі варожы ковельскі гарнізон. Ням. камандаванне мусіла перакінуць да Ковеля 3 танкавыя і 4 пяхотныя дывізіі і дэблакіравала ковельскі гарнізон. Войскі фронту, хоць не поўнасцю выканалі задачу, але адцягнулі з іншых франтоў значныя сілы праціўніка і замацаваліся на ўсх. подступах да Ковеля. Расфарміраваны паводле рашэння Стаўкі 4.4.1944, арміі ўключаны ў 1-ы Бел. фронт.

Літ.: Гл. пры арт. *Беларускі фронт першы.*

М. І. Камінскі. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ ДРУГІ, фронт у Вял. Айч. вайну 1941—45. Утвораны рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання 19.4.1944 на магілёўскім напрамку з арміі левага крыла скасаванага Заходняга фронту. Камандуючым ген.-палк. Г. Ф. *Захараў*, з ліст. 1944 Маршал Сав. Саюза К. К. *Ракасоўскі*; чл. Ваен. Савета ген.-л. Л. З. Мехліс, з 27.7.1944 ген.-л. М. Я. Субоцін, у 1945 ген.-л. А. Г. Рускіх; нач. штаба ген.-палк. А. М. Багалюбаў. У склад фронту ўвайшлі арміі: 33-я (ген.-л. В. Да. Кручонкін), 49-я (ген.-л. І. Ц. Грышын), 50-я (ген.-л. І. В. Болдзін) і 4-я паветраная (ген.-палк. К. А. *Вяршынін*); з ліп. 1944 — 3-я (ген.-палк. А. В. *Гарбатаў*). Войскі фронту ўдзельнічалі ў *Беларускай аперацыі 1944, Мінскай аперацыі 1944, Магілёўскай аперацыі 1944*, у разгроме групы армій «Цэнтр», вызвалілі Магілёў (28 чэрв.), Гродна (16 ліп., з войскамі 3-га Бел. фронту), Беласток (27 ліп.). У ліст. 1944 у склад фронту ўключаны арміі: 48-я (ген.-палк. М. І. Гусеў), 65-я (ген.-палк. П. І. *Батаў*), 70-я (ген.-палк. В. С. Папоў), 2-я ўдарная (ген.-палк. І. І. Фядзюнінскі), 5-я гвардз. танкавая (ген.-палк. В. Ц. Вольскі), а 33-я і 50-я арміі перададзены ў склад 1-га і 3-га Бел. франтоў. Войскі фронту ўдзельнічалі ў *Усходнепрускай аперацыі 1945*, Усх.-памеранскай і ў *Берлінскай аперацыі 1945*. Расфарміраваны ў 1945.

Літ.: Гл. пры арт. *Беларускі фронт першы.*

М. І. Камінскі. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ ПЕРШЫ, фронт у Вял. Айч. вайну 1941—45. Рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання 20.10.1943 Цэнтральны фронт перайменаваны ў Беларускі, а 17.2.1944 — у Першы Беларускі фронт. Камандуючыя ген. арміі (з 29.6.1944 Маршал Сав. Саюза) К. К. *Ракасоўскі*, з 16.11.1944 Маршал Сав. Саюза Г. К. *Жукаў*; чл. Ваен. Савета ген.-л. М. А. Булганін і ген.-л. К. Ф. Цялегін; нач. штаба ген.-палк. М. С. Малінін. Спачатку ў склад фронту ўваходзілі арміі: 3-я (ген.-л. А. В. *Гарбатаў*), 11-я (ген.-л. І. І. Фядзюнінскі), 48-я (ген.-л. П. Л. Рамаценка), 50-я (ген.-л. І. В. Болдзін), 61-я (ген.-л. П. А. Белоў), 63-я (ген.-л. У. Я. Калпакчы), 65-я (ген.-л. П. І. *Батаў*) і 16-я паветраная (ген.-л. С. І. *Рудзенка*). Войскі фронту ў сярэдзіне кастр. 1943 пачалі наступленне на гомельска-бабруйскім напрамку, 16 кастр. фарсіравалі Дняпро на Пд ад Лоева, вызвалілі Лоеў і прайшлі на Захад 15—20 *км*, у 2-й пал. кастр. і пач. ліст. вялі баі за расшырэнне плацдарма на Дняпры, 10—30 ліст. ажыццявілі *Гомельска-Рэчыцкую аперацыю 1943*, фарсіравалі Сож і Дняпро, 17 ліст. вызвалілі Рэчыцу, 26 — Гомель, к канцу ліст. замацаваліся на рубяжы Чавусы — Новы Быхаў — на У ад Рагачова — Стрэшын — р. Прыпяць на ПдУ ад Мазыра і перайшлі да абароны. 61-я і 65-я арміі 8.1.1944 зноў пачалі наступленне, вызвалілі 14 студз. Мазыр і Калінкавічы (61-я армія 17 люг. перададзена ў склад 2-га Бел. фронту і вернута ўлетку 1944). 3-я і 50-я арміі 21 люг. перайшлі ў наступленне ў раёне Рагачова, фарсіравалі Дняпро, 24 люг. вызвалілі Рагачоў, перарэзалі чыгунку Магілёў — Жлобін і на правым беразе Дняпра паміж Быхавам і Рагачовам стварылі плацдарм шыр. 60 *км* і глыб. да 25 *км*. У крас. 1944 і ў час *Беларускай аперацыі 1944* у склад фронту ўвайшлі таксама арміі: 70-я (ген.-л. В. С. Папоў), 47-я (ген.-л. М. І. Гусеў, пазней ген.-м. Ф. І. Перхаровіч), 69-я (ген.-л. У. Я. Калпакчы), 6-я паветраная (ген.-л. Ф. П. Палынін), 28-я (ген.-л. А. А. Лучынскі), 8-я гвардзейская (ген.-палк. В. І. *Чуйкоў*), 2-я танкавая (ген.-палк. С. І. Багданаў), 1-я Войска Польскага (ген.-л. З. Берлінг), 2-і і 7-ы гвардз. кав. карпусы і *Дняпроўская ваенная флатылія* (капітан 1-га рангу, пазней контр-адм. В. В. Грыгор'еў). 3-я, 28-я, 48-я, 65-я, 16-я паветр. арміі і конна-механізаваная група ген.-л. І. А. Пліева ажыццявілі 24—29.6.1944 *Бабруйскую аперацыю 1944*, вызвалілі Жлобін (26 чэрв.), Асіповічы (28 чэрв.), ліквідавалі акружаную ў раёне Бабруйска варожую групоўку і 29 чэрв. вызвалілі Бабруйск. Войскі фронту разам з 1-м Прыбалтыйскім, 2-м і 3-м Беларускімі франтамі ўдзельнічалі ў разгроме групы армій «Цэнтр». Яны вызвалілі Слуцк (30 чэрв.), Стоўбцы, Гарадзею, Нясвіж (2 ліп.), Ковель (6 ліп.), Баранавічы (8 ліп.), Пінск (14 ліп.) (гл. *Баранавіцка-Слонімская аперацыя 1944*); садзейнічалі вызваленню Мінска (3 ліп.; 18 ліп.— 2 жн. акружылі і знішчылі ў раёне Брэста варожую групоўку, вызвалілі Брэст (28.7.1944) і частку Польшчы (гл. *Люблінска-Брэсцкая аперацыя 1944*). Войскі фронту ўдзельнічалі ў *Вісла-Одэрскай аперацыі 1945*, 10 люг.— 4 крас. ва Усходнепамеранскай, у *Берлінскай аперацыі 1945*. Расфарміраваны ў 1945.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—1945, т. 3—5, М., 1961—1963; Рокоссовский К. К. Солдатский долг, М., 1968; Жуков Г. К. Воспоминания и размышления. М., 1969.

М. І. Камінскі. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ ТРЭЦІ, фронт у Вял. Айч. вайну 1941—45. Утвораны рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання 24.1.1944. Камандуючыя ген. арміі І. Д. *Чарняхоўскі*, з 20.2.1945 Маршал Сав. Саюза А. М. *Васілеўскі*; чл. Ваен. Савета ген.-л. В. Е. Макараў, ген.-л. І. С. Хахлоў; нач. штаба ген.-палк. А. П. Пакроўскі. У склад фронту ўвайшлі арміі: 39-я (ген.-л. І. І. Людніко́ў), 5-я (ген.-палк. М. І. Крылоў), 31-я (ген.-палк. В. В. Глаголеў, з 17.1.1945 ген.-л. П. Р. Шафранаў), 5-я гвардз. танкавая (маршал бранятанкавых войск П. А. *Ротмістраў*), 11-я гвардз. (ген. палк. К. М. *Галіцкі*), 1-я паветраная (ген.-палк. М. І. Крукін). Войскі фронту з 1-м і 2-м Бел. і 1-м Прыбалт. франтамі ўдзельнічалі ў *Беларускай аперацыі 1944, Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944*, вызваленні Віцебска (26 чэрв.), Оршы (27 чэрв.), Барысава (1 ліп.), Вілейкі (2 ліп.), *Мінскай аперацыі 1944*, у ходзе якой з 1-м Бел. франтам вызвалілі Мінск (3 ліп.), у ліквідацыі асн. сіл. групы армій «Цэнтр»; ажыццявілі *Вільнюскую аперацыю 1944*, вызвалілі Маладзечна (5 ліп.), Ліду (9 ліп.), Вільнюс (13 ліп.), Гродна (16 ліп.; з 2-м Бел. франтам); ажыццявілі Каўнаскую аперацыю, вызвалілі Каўнас (1 жн.), большую ч. Літ. ССР і выйшлі да граніц Усх. Прусіі. 5—12.10.1944 удзельнічалі ў Мемельскай і Усходнепрускай аперацыях 1945. Расфарміраваны ў 1945.

Літ.: Гл. пры арт. *Беларускі фронт першы.*

М. І. Камінскі. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ЦЫРКАВЫ КАЛЕКТЫЎ, створаны ў Мінску 11.2.1959. Першая праграма, паказаная пры адкрыцці Дзярж. цырка БССР, падрыхтавана Цэнтр. студыяй цыркавога мастацтва (маст. кіраўнік Я. Ц. *Мілаеў*). З гэтай праграмай праіснаваў да 1960. У 1961 пад назвай Б. ц. к. створаны новы калектыў. 23.9.1961 адбыўся першы паказ праграмы «Бывайце здаровы» (маст. кіраўнік А. С. *Шаўнавакылаў*). Калектыў гастраліруе па Сав. Саюзе і за мяжой (Польшча, 1959; Румынія, 1963). 50-годдзю БССР прысвечана праграма «Красуй, Радзіма-Беларусь!» (1968).

Літ.: Родинский Д. Под голубым куполом, «Неман», 1963, № 5.

БЕЛАРУСКІ ШТАБ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ (БШПР), аператыўны орган ЦК КП(б)Б для кіраўніцтва партызанскім рухам на Беларусі, акупаванай нямецкімі фашыстамі ў Айч. вайну. Створаны 9.9.1942 паводле пастановы Дзярж. камітэта абароны СССР. Начальнікам БШПР быў сакратар ЦК КП(б)Б П. З. *Калінін*, нам.— І. А. *Крупенка*, Р. Б. *Эйдзінаў*, І. І. *Рыжыкаў*, І. П. *Ганенка*. Падпарадкоўваўся *Цэнтральнаму штабу партызанскага руху* (ЦШПР). Меў аддзелы: аператыўны, спец. інфармацыі, разведвальны, сувязі, шыфравальны, сакрэтны, кадраў, сан. службы, мат.-тэхн. забеспячэння, фінансаў. БШПР падбіраў, рыхтаваў і засылаў у варожы тыл партыз. камандныя кадры, забяспечваў партызанаў зброяй і боепрыпасамі, арганізоўваў аператыўную разведку, вёў улік партызан і іх сем'яў, выдаваў ім дакументы, прысвойваў воінскія званні байцам і камандзірам, прадстаўляў да ўзнагарод. За гады Айчыннай вайны ЦК КП(б)Б і БШПР накіравалі ў тыл ворага больш за 10 тыс. байцоў і арганізатараў партыз. руху, 9 тыс. з іх прайшлі спец. падрыхтоўку; пераправілі партызанам 236 радыёстанцый, 2674 кулямёты, 1383 процітанкавыя ружжы, 1384 міны, 41 776 вінтовак, 18 684 аўтаматы, 7124 пісталеты і наганы, 44 тыс. камплектаў адзення, боепрыпасы і медыкаменты. У 1-й пал. 1943 БШПР кіраваў аперацыяй *«рэйкавая вайна»* на Беларусі. Спачатку размяшчаўся ў прыфрантавой палосе (в. Цімохіна Таропецкага р-на Калінінскай вобл.), з ліст. 1942 на чыг. ст. Сходня пад Масквой, з люг. 1944 у в. Чонкі Гомельскага р-на, з ліп. 1944 у в. Лошыца каля Мінска. Існаваў да 1946.

І. С. Крайчанка. Мінск.

БЕЛАРУСКІ ШЫННЫ КАМБІНАТ, буйная новабудоўля нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці. Размешчаны ў Бабруйску. Буд-ва пачалося ў 1965, абумоўлена хуткім развіццём у БССР машынабудавання. Асн. прадукцыя: шыны для аўтамабіляў, трактароў, камбайнаў, скрэпераў, матацыклаў і інш. машын. Побач з камбінатам — навуч. гарадок шыннікаў, будуюцца 4 жылыя мікрараёны, 2 кінатэатры, Палац культуры, камбінаты грамадскага харчавання і бытавых паслуг, спартыўны комплекс, паліклініка.

БЕЛАРУСКІ ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ, заснаваны ў сак. 1966 у мяст. Белавежа Гайнаўскага пав. Беластоцкага ваяводства (ПНР) *Беларускім грамадска-культурным таварыствам* (БГКТ). Большасць экспанатаў (каля 900) сабрана сярод бел. насельніцтва, што жыве ў Польшчы. Аддзелы: апрацоўка зямлі і раслінных прадуктаў; гаспадарка (прылады працы, рыбнай лоўлі, бортніцтва, паляванне); пар. промыслы і прадукты рамёстваў (бандарства, ганчарства, ткацтва); прадметы побыту, хатняе начынне, посуд; вопратка; пар. мастацтва (тканыя, вышываныя, вязаныя вырабы, аздобы і ўпрыгожанні, плеценкі з кары і саломы) і інш. Музей збірае і вядзе навук. апрацоўку новых экспанатаў, у т. л. матэрыялаў пра жыццё і рэвалюц. барацьбу бел. насельніцтва за сац. і нац. вызваленне ў часы бурж. Польшчы, арганізоўвае перасоўныя выстаўкі, экскурсіі, лекцыі, сустрэчы. Наведвае каля 8 тыс. чал. за год.

У. Гаўрута. Гайнаўка. ПНР.

«БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЦІ», штотыднёвая грамадска-палітычная і літаратурная газета, якая выдавалася ў Вільні на бел. мове з 14.9.1921 да студз. 1922. Выйшла 16 нумароў. Крытыкавала каланізатарскую палітыку ўлад т. зв. Сярэдняй Літвы і бурж. Польшчы ўлад т. зв. Сярэдняй Літвы і бурж. Польшчы ў дачыненні да бел. народа, змагалася за навучанне на роднай мове, асвятляла поспехі нац.-дзярж. буд-ва ў БССР. Друкавала гістар. і этнагр. матэрыялы пра Беларусь,

фальклорныя запісы, творы П. Багрыма, Ф. Багушэвіча, А. Абуховіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Каганца, У. Галубка, Г. Леўчыка, У. Жылкі і інш. бел. пісьменнікаў. З літ. і гістар. матэрыялаў, змешчаных у газеце, складзены «Дэкламатар» і тры зб. «Б. в.», выдадзеныя ў 1921. За апазіцыйны кірунак газета закрыта ўладамі Сярэдняй Літвы. Рэдактар-выдавец М. Гарэцкі быў пасаджаны ў астрог на Лукішках, потым высланы з Вільні. *Дз. Я. Бугаёў.* Мінск.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕЧАРЫНКІ, вечары беларускай нацыянальнай культуры ў дарэвалюцыйныя гады. Вядомыя з 1905. Адзін з першых арганізатараў І. *Буйніцкі.* Наладжваліся па ініцыятыве муз.-драм. гурткоў, якія існавалі ў Вільні (Б. в. ў 1910, 1912, 1913), Мінску, Гродне, Полацку, Слуцку, Капылі, Дзісне, Давыд-Гарадку, Радашковічах, Празароках і інш. Арганізоўваліся таксама ў Пецярбурзе (першая ў 1910), на Украіне (Ніжнедняпроўск), у Сібіры і інш. мясцінах краіны, дзе жылі беларусы. У праграмах Б. в.— харавыя спевы бел. нар. песень, бел. вершы і танцы, спектаклі. Рэпертуар: «Паўлінка» Я. Купалы, «Модны шляхцюк» К. Каганца, «Міхалка» Далецкіх, «Пра шкоду тытуню» А. Чэхава, «Разумны і дурань» І. Карпенкі-Карага. На Б. в. у Карэлічах (1912) тэатралізаваны бел. нар. песні і вершы Я. Купалы на тэмы пораў года. Б. в. карысталіся вялікай папулярнасцю і садзейнічалі станаўленню бел. прафесіян. т-ра, арганізацыі новых аматарскіх гурткоў.

Літ.: Няфёд У. Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі, Мн., 1959, с. 86—92; Гурэеў В. «Беларуская вечарынка» ў мястэчку Карэлічы, «Маладосць», 1958, № 4. *А. В. Сабалеўскі.* Мінск.

БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ (спартыўныя), разнастайныя, пераважна рухавыя, спаборніцтвы. Эфектыўны сродак фізічнага, разумовага, маральнага і эстэтычнага выхавання. Узніклі і развіваліся са стараж. часоў. Не маюць строгіх правілаў і ў розных месцах у адну і тую ж гульню гуляюць па-рознаму. Падзяляюцца на: 1) вытворчыя, якія паказваюць працэсы паляванння, рыбалоўства, жывёлагадоўлі, земляробства (напр., лось, рыбак, мядзведзь, воўк і гусі, лён, проса, мак); 2) ваенныя і спартыўныя, якія маюць спаборніцкі характар (салдаты, кола, млынок, шпень); 3) бытавыя з прыпеўкамі і дэкламацыямі. Некат. Б. н. г. ўпамінаюцца ў былінах і летапісах і ў крыху змененым выглядзе дайшлі да нашых дзён. Гульні захоўваюцца ў народзе як састаўная частка яго нац. культуры.

Азярод, гульня з дугою. Удзельнікі гульні б'юць дугу за адзін канец, а другім стукаюць аб зямлю так, каб дуга спружыніла і пераляцела цераз азярод (абудаванне для сушкі снапоў, сена, гароху, выш. 7—8 *м*). Пераможца той, у каго дуга больш разоў пераляціць цераз азярод.

Апука, гульня дзвюх каманд. Кожная выбірае вядучага. На пляцоўцы праводзяць дзве лініі паміж камандамі на адлегласці 30—40 *м*. Удзельнікі каманды «горада» па чарзе бітой кідаюць апуку (мяч памерам з тэнісны) у бок праціўніка («у поле»). Калі ігракі «палявой» каманды зловяць мяч в лёту, каманды мяняюцца месцамі. Калі мяч не злоўлены, «палявыя» ігракі падхопліваюць яго і



Старадаўняя гульня апука.

ад сваёй лініі кідаюць у іграка «гарадской» каманды, які ў гэты час павінен дабегчы да чужой лініі і вярнуцца да сваіх; калі мяч пападзе ў іграка, каманды таксама мяняюцца месцамі. У залежнасці ад мясцовай назвы мяча, «горада», «поля» і інш. элементаў гульня наз. перагон, салавей, ілкі, лавец і інш.


Бабкі, гульня з касцямі. Некалькі пар бабак (падкапытныя косці жывёл) ставяць на роўным месцы ў рад («кон») і з умоўленага месца кожны ігрок па чарзе збівае іх біткай (вялікая бабка, набітая свінцом). Збітыя бабкі лічацца выйгранымі. Разнавіднасць гульні — біток, дзе замест бабак выкладаюць піраміду арэхаў, вакол якой праводзіцца круг — «горад». Ігракі з умоўленага месца кідаюць найбольшы арэх-біток у піраміду. Арэхі, выбітыя за мяжу круга, лічацца выйгранымі. Той, хто прамахнуўся, дабаўляе ў піраміду арэх. Гульня скончана, калі арэхі выбіты з «горада».

Барацьба да крыжа, нагадвае вольную барацьбу. Барцам дазваляецца штурхаць, даваць падножкі, хапаць за ногі. Перамагае той, хто прыцісне праціўніка спінаю да зямлі і ўтрымае яго рукі, разведзеныя ў бакі.

Барацьба на крыжы, нагадвае рус. барацьбу ў абхват. Праціўнікі абхватваюць адзін аднаго, і той, хто паваліць праціўніка на зямлю,— пераможца. Падножкі, штуршкі не дазваляюцца.

Була, камандная гульня. Кожная каманда выбірае вядучага. Ён моцна б'е палкай з загнутым канцом па буле (драўляным шары) і гоніць яе ў бок праціўніка, каманда памагае яму. Праціўнікі стараюцца перахапіць і вярнуць булу да ўмоўленай мяжы.

Гула, народная гульня. Ігракі дзеляцца на дзве каманды — дружыны. Кожная дружына выбірае «вялікага», ці «выбранніка» — найб. дужага іграка, які кідае ў бок праціўніка гулу



Старадаўняя гульня гула.

(каменнае ці жалезнае ядро, а ў некат. месцах — кола воза). Дружына праціўніка як мага раней павінна спыніць гулу. З таго месца, дзе гула спынена, «выбранніка» другой дружыны кідае ле нанавад. Гульня цягнецца да таго часу, пакуль адна з дружын не перакіне гулу за ўмоўленую мяжу.

Гуські, зімовая гульня. На краі круглай ледзяной пляцоўкі дыяметрам 10—15 *м* выбіваюць «гнёзды» (ямкі дыяметрам 25—30 *см*). Ігракі маюць калкі (палкі даўж. 1—1,2 *м*, раздвоеныя на

канцы) і гуські (цуркі памерам (*см*) 12×4). Кожны па чарзе кладзе гусёк у цэнтр пляцоўкі. Па сігнале астатнія ігракі ад сваіх гнёздаў б'ягуць да цэнтра і ўдарамі калкоў стараюцца загнаць гусей у сваё «гняздо». Перамагае той, хто загоніць больш гускоў.

Калаўрот. На ледзяной пляцоўцы ўбіваюць кол, на яго надзяюць кола з жэрдкай, да якой прыкідоўваюць санкі. Некалькі чалавек круцяць ко-



Калаўрот.

ла. Санкі хутка пясуцца па крузе, і хто даўжэй утрымаецца на іх — пераможца. Часам удзельнікі гульні стаяць на санках.

Пацяг, групавая гульня. Ігракі счапляюцца сагнутымі ў локцях рукамі ў два ланцугі. «Завадны», што стаіць наперадзе ланцуга, захопліваць адзін аднаго. На сігнале кожны ланцуг іграюў цягне ў свой бок, каб разарваць ланцуг праціўніка або зацягнуць «заваднога» за ўмоўленую мяжу. Гл. таксама *Гульні народныя* і *Гульні дзіцячыя.*

Літ.: Довнар-Запольский М. Крестьянские игры в Минской губернии, «Живая старина», 1891, в. 4; Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии, «Этнографическое обозрение», 1897, № 3; Былеева Л. В. Сборник подвижных игр. М., 1960. *К. А. Куліновіч.* Мінск.

БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ СТРАВЫ. Бел. кулінарыя ўстойліва захоўвае нац. спецыфіку, якая здаўна залежала ад накіравапасці нар. гаспадаркі: вытворчасці збожжа, бульбы, агародніны, мяса. У ёй шмат агульнага з кухняй суседніх, асабліва ўсходнеславянскіх народаў, многае яна запазычыла і ў сваю чаргу ўплывала на іх кулінарыю. Бел. кулінарыя вызначаецца разнастайнасцю агародніных, бульбяных і мясных страў, выкарыстаннем мукі і круп. З глыбокай старажытнасці асноўным харчовым прадуктам у беларусаў быў хлеб з квашанага жытняга цеста.

Сярод Б. н. с. вядомыя *клёцкі,* камы, *вацірка,* вараніна, *кулеш,* лянуха, галушкі; з крупяных — *крупнік* (крупеня), асабліва каша: ячменная (гушча, панцак), аўсяная (аўсянка), грэцкая, гарохавая. Гатуюць крупяныя стравы з мясам, смажаным салам, малаком, маслам, сытою, дадаюць розныя прысмакі, закрасы. Як і ў інш. усх. славян, у беларусаў пашраны бліны: рошчыняныя бліны і аладкі з аўсянай, грэцкай, жытняй, пшанічнай мукі, прэсныя бліны з гарохавай або аўсянай мукі. Ядуць іх звычайна з *мачанкай* альбо са смажаным салам, смятанаю, мёдам. З даўніх часоў з квашанага цеста пякуць скародзікі, сачні, паляніцы, драчоны (заквашаныя па сыроватцы), лапуны з начынкаю, пасыпаныя кменам ці макам. З прэснага цеста выпякаюць на патэльні ці ў прыску *праснакі,* прышчы, плешчанкі. З лепшых гатункаў пшанічнай мукі пякуць каржы, *хрушчы* (хрусты), сухары, пернікі, цясткі; з квашанага пшанічнага цеста — пампушкі з цёртымі канопляміі; варэнікі з ягадамі, зялёнай цыбуляю; пірагі з грыбамі, капустаю, яйкамі. Асабліва разнастайныя па Беларусі стравы з бульбы, якую называюць «другім хлебам». Іх каля 200, у т. л. *бабка,* бульбяная каша (таўканіца, камякі), *бульбянікі, бульбяная запяканка* (бульбянка), *дранікі,* клёцкі драныя, клёцкі з душамі (цапяліны), бульбяная яечня, *налісні кі, капытка,* булён, тушонка, параная бульба, каплук, камы і інш. Дранай бульбай набіваюць свіныя кішкі, трыбух і смажаць у печы. Пашраны на Беларусі *халаднікі* (з капусты, буракоў, шчаўя, бурачнага бацвіння) і *поліўкі* (з грыбамі, цыбуляю). З бручкі (грыжаны) гатуюць грыжанку, з гарбуза — гарбузянку. Боб, фасолю, гарох параць у струках або пражаць. Моркву, бручку, рэпу дадаюць у стравы і як састаўныя часткі. З мясных страў найбольш вядомыя *пячысты, калдуны,* мачанка (верашчака, пражаніна, маканіна), сальцісон, *студзіна* (квашаніна, халадзец), галубцы, каўбасы. У рацыён насельніцтва вёсак каля рэчак і азёраў уваходзяць стравы са свежай рыбы, у т. л. рыбная юшка. З напіткаў пашраны *квас*: хлебны, ягадны, бурачны са шчаўем, *бярозавік,* кляновік, ліпец, а таксама мядовыя напіткі (*сыта, збіцень*), піва, варануха. З яблык, лясных і садовых ягад гатуюць узвар, кампоты, *кісель, кулагу,* а таксама робяць наліўкі, настойкі, вараць варэнне. Многа ўжываюць сырой агародніны — рэдзькі, турнэпсу, радыскі, агуркоў, зялёнай цыбулі, салаты; свежых і сушаных лясных ягад — чарніц, малін, суніц. Капусту, буракі, агуркі квасяць і соляць. Садавіну, а таксама брусніцы, журавіны мочаць, замарожваюць. Шырока ўжываюць грыбы сушаныя, соленыя, марынаваныя.

Летам ядуць 4 разы на дзень: снедаюць, абедаюць, палуднуюць, вячэраюць; зімою 3 разы. Абед звычайна складаецца з 3—4 страў, прычым першыя 2 стравы робяць рэдкія. Спачатку падаюць халаднік, буракі, капусту (з мясам, каўбасою, салам, рыбаю або засквараныя); потым — малочны крупнік, зацірку, булён, свежую капусту; на трэцюю страву — тушаную бульбу, бручку, моркву, бабку, крупяную кашу (з сыраквашаю ці салодкім малаком).

У дарэвалюц. гады з жытняй мукі грубага памолу пяклі т. зв. градовы, ці пушны хлеб. Калі жытнюю муку напалову мяшалі з грэцкай, аўсянай ці ячменнай, хлеб называлі паловы, калі муку мяшалі з бульбай — бульбяны. Галодная вясной беднякі дадавалі ў хлебнае цеста драныя буракі, мякіну. Амаль выйшлі з ужытку: *талакно,* саладуха (кулага), *жур* (аўсяны кісель), баўтуха (каватуха), жытняя каша «цалковая» (з цэлых круп) і «дранай» (з сечаных круп); посныя стравы: печанка, брускі, путра (кіслая каша), цурацы (рулі), веляніна з закалотаю (халаднік з крапівы, цыбулі, дзягілю). З крупяных страў на Палесі Беларусі быў пашраны суржык (каша з сумесі малатай пшаніцы, жыта, гароху, ячменю і аўса); на Пд — пячона (прасяная каша, запечаная з салам у прыску).

У мінулым асобныя стравы былі абрадавыя. На радзіны гатавалі *бабіну кашу*, яечню, наліснікі, клінковыя сыры, халоднае мяса, студзіну, квас, пяклі пшанічныя пірагі, аладкі з цёртым макам і цукрам, пернікі, каржы, хрушчы. З хлебам ішлі ў сваты, на вяселле, радзіны, хлебам-соллю сустракалі і праводзілі гасцей. Ідучы ў адведкі да парадзіхі, з кіслага пшанічнага цеста пяклі перапечкі, з прэснага — сухары. На вяселлі абавязкова былі *каравай*, пячысты, смажаніна, локшына (макароны), агародніна. За жалобным сталом на хаўтурах і на каляды елі звараную на мёдзе *кучую*, клёцкі, мучныя ці бульбяныя, начыненыя мясам, канун, аўсяны кісель, бліны, рыбную юшку, поліўку з грыбамі і інш. На тоўстую каляду гатавалі кашу і студзіну, на саракі пяклі піражкі-жаваранкі, на масленіцу — бліны. У некат. месцах памінальны абед на дзяды, радаўніцу гатавалі з 9—12 страў. На святы і інш. ўрачыстасці ладзілі шчодрае частаванне. Госці паводле даўніх звычаяў прыносілі з сабою наедак і напітак, загорнутыя ў прыгожы ручнік. Паважаным гасцям, у т. л. маладому на заручынах, падавалі печыво-цалкавуху і халодныя закускі: *галяндвіцу*, вэндліну, каўбасы, грыбы.

За гады Сав. улады ежа беларуса-селяніна стала больш багатая, разнастайная, каларыстая. У гарадах усё шырэй развіваецца грамадскае харчаванне, ствараюцца сталоўкі і ў вёсках. У меню сталовых, рэстаранаў, кафэ ўваходзяць і Б. н. с. Найбольш смачныя традыцыйныя беларускія народныя стравы падрыхтаваны і ў лепшых сталовых, рэстаранах за межамі БССР.

Літ.: Народы европейской части СССР, т. 1, М., 1964, с. 848—852; Очерки общей этнографии. Европейская часть СССР, М., 1968, с. 231—232; Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов, Мн., 1968; Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 8, Вильна, 1912; Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 3, СПб., 1902; Киркор А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию, «Этнографический сборник», 1858, в. 3; Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности, Витебск, 1895; Белорусские блюда, Мн., 1966; Moszyński K. Kultura ludowa słowian, t. 1, 2 wyd., Warszawa, 1967.

І. П. Корзун. Мінск.

БЕЛАРУСКІЯ СЕКЦЫІ РКП(б), бальшавіцкія арганізацыі, якія існавалі ў 1918—19 як часткі мясцовых парт. арганізацый у Петраградзе, Маскве, Саратаве, Тамбове і Казані. Складаліся з рабочых і бежанцаў беларусаў — чл. РКП(б), працавалі ў кантакце з *Беларускім нацыянальным камісарыятам*.

Першая Б. с. РКП(б) утварылася ў Петраградзе ў пач. крас. 1918 на аснове *Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі*. Накіроўвала паліт. лінію Петраградскага аддзялення Белнацкома (Беларускі аддзел Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза камун Паўн. вобл.), вяла агіт.-масавую работу сярод беларусаў — жыхароў Петраграда і маракоў Балтыйскага флоту, пасылала ў Беларусь прапагандыстаў і л-ру. Прадстаўнікі Б. с. РКП(б) у Петраградзе ўдзельнічалі ў рабоце Усерасійскага з'езду бежанцаў з Беларусі, 1-й канфер. беларускіх сав. арг-цый (жн. 1918), Беларускага вольна-эканам. таварыства, культ.-асвет. клуба *«Беларуская хатка»*. Б. с. РКП(б) у Петраградзе сфарміравала *Першы беларускі камуністычны атрад*. На 14.12.1918 яна налічвала 92 чл. і 118 спачувальнікаў. У Маскве сходы камуністаў-беларусаў, на якіх абмяркоўвалася пытанне стварэння Б. с. РК(б), адбыліся 25.5 і 3.6. 1918. У ліп. 1918 была створана фракцыя камуністаў служачых Белнацкома. 3.11.1918 па яе ініцыятыве ў Маскве скліканы сход камуністаў-беларусаў, які пастанавіў стварыць у Маскве Б. с. РКП(б) і выбраў бюро ў складзе І. В. Лагуна, М. Л. Хрэнава, З. Ф. Жылуновіча, А. Х. Усцілоніча. Прэзідыум Прэсненскага райкома РКП(б) 14.11.1918 зацвердзіў Б. с. РКП(б) у Маскве. 24.11.1918 адбыўся першы агульны сход Б. с. РКП(б) у Маскве, на якім быў выбраны к-т секцыі: Жылуновіч, П. Г. Клыш, З. С. Чарнушэвіч, А. Р. Чарвякоў, А. Дзедзя, І. С. Няцецкі, Я. Л. Дыла, І. Мазур, У. С. Фальскі. Газ. Белнацкома *«Дзянніца»* з 3.12.1918 (№ 40) стала адначасова і органам Б. с. РКП(б) у Маскве. Б. с. РКП(б) у Саратаве ўтварылася ў вер. 1918 і на снежань таго года налічвала 30 чл. і 32 спачувальнікаў. Секцыя мела клуб, правяла 6 мітынгаў беларусаў-бежанцаў. Б. с. РКП(б) у Тамбове налічвала 60 чл. і да 100 спачувальнікаў.

Секцыі мелі сувязь паміж сабою. 21—23.12.1918 у Маскве адбылася канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б). Яна выбрала Цэнтр. бюро Б. с. РКП(б), выказала думку пра неабходнасць стварэння Беларускага Савецкага ўрада. 29.12.1918 Б. с. РКП(б) у Маскве арганізавала сход, на якім прысутнічала 400 беларусаў-камуністаў і спачувальнікаў. Сход выказаў надзею, што Беларусь стане незалежнай Савецкай рабоча-сялянскай рэспублікай. У той дзень нар. камісар па справах нацыянальнасцей І. В. Сталін у сувязі з ад'ездам з Масквы прадстаўнікоў Б. с. РКП(б) на VI Паўн.-Зах. абласную канфер. РКП(б) [гл. *Першы з'езд КП(б)Б*] паведамляў А. Ф. Мяснікову: «Сёння выязджаюць у Смаленск беларусы. Вязуць з сабой Маніфест. Просьба ЦК партыі і Леніна прыняць іх, як малодшых братоў, магчыма яшчэ не вопытных, але гатовых аддаць сваё жыццё партыйнай, савецкай рабоце». На І з'ездзе Кампартыі Беларусі ад Б. с. РКП(б) прысутнічалі Жылуновіч, Лагун, Клыш, В. Ханін; Жылуновіч і Лагун выбраны ў Цэнтр. Бюро КП(б)Б. У склад *Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада БССР* ад Б. с. РКП(б) увайшлі Жылуновіч, Чарвякоў, Дыла, Чарнушэвіч, А. І. Квачанюк, І. І. Пузыроў. У канцы 1918 Б. с. РКП(б) узніклі і на Беларусі. Рашэннем ЦБ КП(б)Б ад 15.1.1919 распушчаны. Са стварэннем Літоўска-Беларускай ССР (люты 1919) бел. секцыі РКП(б) пачалі аб'ядноўвацца з літоўскімі. ЦК РКП(б) зацвердзіў Аб'яднанае Літоўска-Беларускае Цэнтр. бюро пры ЦК РКП(б). З аднаўленнем 31.7.1920 Беларускай ССР ЦК РКП(б) даў санкцыю на падзел літоўска-беларускіх секцый. Але Б. с. РКП(б) не аднавіліся.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, с. 429—434; Бугаев Е. Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии, М., 1950; Шарапов Я. Ш. Национальные секции РКП(б), Казань, 1967; Малашко А. М. К вопросу об оформлении однопартийной системы в СССР, Мн., 1969; Жылуновіч З. Беларускія секцыі РКП і стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі, «Полымя», 1928, № 10; Крушталевич В. А. Организация и деятельность Белорусского национального комиссариата (1918—1919), «История СССР», 1963, № 6.

В. У. Скалабан. Ленінград.

БЕЛАРУСЫ, нацыя. Асн. насельніцтва Беларускай ССР. Рассяленне Б. кампактнае, у асноўным супадае з граніцамі БССР. У СССР паводле перапісу 1959 — 7913 тыс. Б., паводле ацэнкі на 1965 — 8500 тыс.; у БССР — 6532 тыс. Б., 81,1% нас. рэспублікі (гл. табліцу 1); у інш. саюзных рэспубліках 1381 тыс. чал. (гл. табліцу 2).

Табліца 1.

Удзельная вага асоб беларускай нацыянальнасці ў БССР на 15.1.1959 (у працэнтах)

Вобласці	Усяго	У гарадах	У сельскай мясцовасці
Беларуская ССР	81,1	67,0	87,4
Брэсцкая	86,05	64,11	92,9
Віцебская	81,23	72,72	85,25
Гомельская	86,73	68,10	94,17
Гродзенская	60,08	53,09	62,15
Мінская	87,77	73,77	91,0
Магілёўская	87,87	70,57	94,37
г. Мінск	—	63,77	—

Табліца 2.

Удзельная вага беларусаў у насельніцтве саюзных рэспублік на 15.1.1959

Саюзныя рэспублікі	Колькасць, тыс. чал.	У працэнтах да беларусаў	У працэнтах да насельніцтва рэспублікі
БССР	6532	82,5	81,1 (у 1897—78,2%, у 1926—80,6%)
РСФСР	844	10,7	0,7
УССР	291	3,7	0,7
Каз. ССР	107	1,4	1,2
Латв. ССР	62	0,8	2,9
Літ. ССР	30	0,4	1,1
Эст. ССР	11	0,1	0,9
Іншыя рэспублікі	36	0,4	—
Усяго па СССР	7913	100	3,8

Паводле неафіц. звестак за межамі СССР жыве каля 1 млн. Б. (ЗША, Канада, Аргенціна, Аўстралійскі Саюз, ФРГ і інш.) — пераважна нашчадкі працоўных эмігрантаў, што выехалі з Беларусі ў канцы 19 — пач. 20 ст., з Зах. Беларусі ў 1921—39. У ПНР жыве каля 200 тыс. Б. Разам з рускімі і украінцамі Б. складаюць усх. групу славян. *Беларуская мова* разам з суседнімі рус. і укр. належыць да ўсх. групы славянскіх моў.

Фарміраванне беларускай народнасці. У перыяд Кіеўскай Русі. Як рускія і украінцы, Б. паходзяць ад старажытнарускай народнасці, якая склалася ў 9—13 ст. на аснове ўсх.-славянскіх плямёнаў у выніку разлажэння ў іх першабытнаабшчыннага ладу, устанаўлення класавага грамадства і стварэння старажытнарускай раннефеадальнай дзяржавы — *Кіеўскай Русі*.

На ваходніх землях Русі праходзіў стараж. гандлёвы *шлях з варагаў у грэкі*. Тут хутка расцвілі гарады (Полацк, Тураў, Пінск, Віцебск, Мінск, Гродна, Орша, Друцк, Заслаўе, Барысаў, Брэст), развіваліся рамёствы і гандаль. Асабліваў магутным быў у ліку найбольшых эканам., паліт. і культ. цэнтраў Кіеўскай Русі. Развіваліся л-ра (*Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч*), прыкладное мастацтва (*Лазар Богша*). Пісьменнасць пашыралася і сярод простых гараджан, пра што сведчаць *берасцяныя граматы*. У перыяд феад. раздробленасці (12—13 ст.) палітэраз'яднанасць вяла да паступовага адасаблення асобных частак старажытнарус. народнасці і фарміравання на іх аснове трох братніх народнасцей — рускіх, украінцаў і Б. У перыяд феад. раздробленасці Полацкае, Турава-Пінскае княствы падзяліліся на больш дробныя ўдзельныя княствы (Віцебскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагойскае, Лукомльскае, Мінскае, Слуцкае). Насельніцтва іх, акрамя Ст. Русі, дае, апрача патомкаў усх. славян — *крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, бужан*, жылі і леталітоўскія плямёны (*аўкштайты, літва*), называлася паводле гал. горада княства ці землі: полачане, тураўцы, мінляне, берасцейцы, гарадзенцы, случане, пінчукі і г. д., жыхароў Палесся пазней наз. палешукамі.

Беларусы ў Вялікім княстве Літоўскім. У 13—14 ст. тэр. Беларусі ўвайшла ў *Вялікае княства Літоўскае*. Яе паўн.-зах. землі (вакол Ліды, Навагрудка, Ваўкавыска) наз. пэўны час *Чорная Русь*, усх. землі (па Дняпры і Зах. Дзвіне) — *Белая Русь*. Фарміравалася бел. народнасць у 14—16 ст. на аснове распырэння эканам. і культ. сувязей паміж насельніцтвам зах. землі былой Кіеўскай Русі, ва ўмовах барацьбы за нац. незалежнасць супраць інваземнай агрэсіі (татарскія набегі, нямецкая агрэсія, *Грунвальдская бітва 1410*). У выніку адасаблення ад астатніх зямель старажытнарускай дзяржавы ў насельніцтва зах.-рус. зямель пачалі ўзмацняцца ўласцівыя яму асаблівасці мовы, культуры, звычаяў. Эканам. і інш. сувязі, якія ўзмацніліся паміж асобнымі землямі, садзейнічалі таму, што гэтыя асаблівасці станавіліся агульнымі для ўсяго насельніцтва зах.-рус. зямель у Вял. кн. Літ. Важная роля ў наладжванні эканам. сувязей належала гарадам, дзе развівалася рамяство, афармляліся цэхавыя арг-цыі. Многія гарады дамагліся самакіравання, т. зв. магдэбургскага права, што давала ім пэўную самастойнасць у развіцці гандл. сувязей з гарадамі Русі і Зах. Еўропы. Пад уплывам сац.-эканам. і палітфактараў складваюцца рысы бел. народнасці як асобнага этнічнага аб'яднання з уласцівымі яму асаблівасцямі ў мове, культуры, побыце. Як посьбіты больш развітых грамадскіх адносін і багатай культ. спадчыны Кіеўскай Русі, Б. дасягнулі значных поспехаў у развіцці сваёй культуры. Б. мелі значны ўплыў на развіццё феад. адносін Вял. кн. Літ. і культуру яго народаў. Бел. мова юрыдычна стала мовай справаводства і судаводства. На ёй пісаліся дзярж. дакументы, статуты (гл. адпаведныя арт. пра статуты Вял. кн. Літ. 1529, 1566, 1588), «гаспадарскія лісты», граматы, сеймавыя пастановы, летапісы і хронікі *(Аўраамкі летапіс, Баркулабаўскі летапіс, Быхаўца летапіс)*, мастацкія, царкоўныя, перакладныя і інш. творы. Літоўская знаць засвойвала мову, побыт, норавы бел. феадалаў, прымала праваслаўе. У 1-й чвэрці 16 ст. пазвілася бел. кнігадрукаванне, заснавальнікам якога быў вучоны-гуманіст Францыск (Георгій) *Скарына*. Яго кнігі, апрача Беларусі, былі пашыраны ў Рус. дзяржаве і інш. славянскіх краінах. Выдатнымі прадстаўнікамі бел. культуры былі Васіль *Цяпінскі*, Сымон *Будны*, Сімяон *Полацкі*, Лаўрэнцій *Зізаній*, Мялецій


Сматрыцкі, браты *Мамонічы*, Пётр *Мсціславец*, Казімір *Лышчынскі*, Мікола *Гусоўскі*, *Палубес* (С. Іваноў), М. і В. *Вашчанкі*. У 16 ст. на Беларусі распаўсюдзіўся рэфармацыйны рух (гл. *Рэфармацыя*). У гарадах разгортвалася дзейнасць брацтваў, якія стваралі школы, друкарні, шпіталі, вялі антыкаталіцкую прапаганду, узначальвалі нац.-вызв. рух. На тэр. Беларусі ўзніклі непаўторныя ўзоры дойлідства розных архітэктурных кірункаў: крэпасці і замкі ў Гродне, Віцебску, Лідзе, Міры, Крэве, Нясвіжы; дамы-крэпасці, палацы, культавыя збудаванні (царквы-крэпасці ў Сынковічах, Койданаве, Малажэйкаве, Навагрудку; храмы ў Магілёве, Мінску, Гродне, Заслаўі). Бел. майстры і рамеснікі ўдзельнічалі ў аздабленні церамоў Крамлёўскага палаца ў Маскве, Нова-Іерусалімскага манастыра на Істры, Каломенскага палаца (гл. *Арсеній*, *Андрэеў* Іван, *Міхайлаў* Клім, *Сямёнаў* Максім). Вялікі ўклад Б. у стварэнне першага рус. тэатра (гл. *Тэатр пры двары цара Аляксея Міхайлавіча*). Аднак умацаванне вялікакняскай улады, а потым расшырэнне правоў феадалаў у Вял. кн. Літ. суправаджаліся ўзмацненнем эксплуатацыі прац. народу, абвастрэннем класавай барацьбы, якая вылілася ў шматлікія нар. паўстанні.

Беларусы ў Рэчы Паспалітай. Польскія феадалы вялі ў адносінах Вял. кн. Літ. палітыку экспансіі (гл. *Крэўская унія 1385*, *Востраўскае пагадненне 1392*, *Гарадзельская унія 1413*). Пасля *Люблінскай уніі 1569*, калі Польшча і Вял. кн. Літ. аб'ядналіся ў *Рэч Паспалітую*, і *Брэсцкай уніі 1596* на Беларусі ўзмацніўся сацыяльны, нац. і рэлігійны прыгнёт. Зямельная рэформа ў сярэдзіне 16 ст. (гл. *Валочная памера*, *«Устава на валокі»*) садзейнічала пашырэнню фальваркова-паншчынnай сістэмы гаспадаркі, павелічэнню паншчынnай павіннасці сялян. Паводле Літоўскага статута 1588 на Беларусі юрыдычна замацавана прыгоннае права. Беларусаў гвалтоўна паланізавалі, акаталічвалі, бел. мова выцяснялася з афіц. ўжытку, а паводле закону 1696 забаранялася ў дзярж. і судовых установах. Закрываліся бел. школы і друкарні, спынялася дзейнасць брацтваў. Феадалы Беларусі засвойваюць польск. мову, пераходзяць у каталіцтва. Аднак працоўныя Беларусі актыўна змагаліся супраць сац. і нац. ўціску. Нар. паўстанні супраць феад. і польска-каталіцкага прыгнёту адбываліся у 1595 пад кіраўніцтвам С. *Налівайкі*, у 1606—10 у Магілёве пад кіраўніцтвам С. *Мітковіча*, у 1623 у Віцебску, у 1633 у Полацку. Б. актыўна ўдзельнічалі ў *вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54* (паўстанні ў Пінску, Тураве, Століне, Магілёве, Быхаве, Давыд-Гарадку пад кіраўніцтвам *Гаркушы*, І. *Галоты*, С. *Падбайлы*, І. *Багдашэвіча*, М. *Крычэўскага*, *Падубскага*, Галавацкага, Мікуліцкага, А. *Нябабы*); у паўстанні 1740—44 пад кіраўніцтвам В. *Вашчылы*. У час *Лівонскай вайны 1558—83*, *руска-польскай вайны 1632—34*, *руска-польскай вайны 1654—67*, *Паўночнай вайны 1700—21* насельніцтва Беларусі намагала рус. войскам. Ва ўмовах узмацнення сац., нац. і рэліг. прыгнёту тысячы Б. пакідалі родныя мясціны і ўцякалі на Украіну, дзе папаўнялі рады запарожскіх казакоў, у Расію. Нац.-вызв. барацьба нар. мас супраць феадалаў-прыгоннікаў і іншаземнага заняволення, за ўз'яднанне з братнім рус. народам садзейнічала далейшаму згуртаванню і кансалідацыі бел. народнасці.

Фарміраванне беларускай нацыі. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы. Уз'яднанне Беларусі з Расіяй. Фарміраванне бел. бурж. нацыі адбывалася ў перыяд разлажэння феад.-прыгонніцкай сістэмы і развіцця капіталіст. адносін. У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) бел. народ уз'яднаны з Расіяй (гл. *Уз'яднанне Беларусі з Расіяй*). Гэтая найвялікшая падзея ў гісторыі Беларусі мела для бел. народа прагрэс. значэнне, адпавядала яго жыццёвым інтарэсам. Эканоміка Беларусі атрымала больш шырокія магчымасці для развіцця прадукцыйных сіл, уцягвалася ў агульнарасійскі рынак, бел. народ далучаўся да сваяцкай, больш развітай рус. культуры, спынялася яго гвалтоўная паланізацыя і акаталічванне. Аднак эканам. і паліт. становішча нар. мас мала палепшала, бо царызм захаваў за феадаламі іх зямельную ўласнасць і пакінуў недатыкальным рэжым прыгонніцкай эксплуатацыі. Палітыка царызму ва ўсіх сферах грамадскага жыцця мела вялікадзяржаўную накіраванасць. Сялянскую рэформу 1861 царызм ажыццявіў у інтарэсах пануючых класаў. Больш як палова зямельных угоддзяў асталася ў руках памешчыкаў, казны, цэркваў, манастыроў. На рэформу сяляне адказалі масавымі хваляваннямі. У студз. 1863 пачалося паўстанне ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве. На тэр. Беларусі яго ўзначаліў выдатны сын бел. народа, рэвалюцыянер-дэмакрат К. *Каліноўскі*. Ён заснаваў першую бел. рэвалюц.-дэмакр. газету *«Мужыцкая праўда»*. Пасля скасавання прыгону на Беларусі хутка развіваўся капіталізм. Ствараліся фабрычна-заводскія прадпрыемствы, пракладваліся чыгункі, каналы. З аднаго боку расла і ўсталёвалася прамысл. буржуазія, з другога — пралетарыят. Капіталізм развіваўся і ў с. гасп., пашыраўся працэс расслаення сялян на кулацтва і сялянскую беднату. З развіццём капіталізму мацаваліся эканам. і культ. сувязі паміж насельніцтвам асобных раёнаў Беларусі. На працягу 19 ст. на базе росту эканам. супольнасці, утварэння агульнага нац. рынку складваецца бел. бурж. нацыя з усімі характэрнымі для яе адзнакамі — агульнасць мовы, тэрыторыі, эканам. жыцця і псіхічнага складу, які выяўляецца ў агульнасці нац. культуры.



Двор беларуса. Пач. 20 ст., в. Жыцень Бабруйскага пав.






Беларуска ў святочным убранні. Пач. 20 ст. Ігуменскі пав. Мінскай губ. (злева). Пастухі. Пач. 20 ст. Пінскі пав.

Заняткі, побыт. Да Кастр. рэвалюцыі асн. заняткам Б. была с. гасп. У пач. 20 ст. больш за 80% насельніцтва Беларусі жыло ў вёсках. У с. гасп. пераважалі паляводства і жывёлагадоўля. Асноўныя с.-г. культуры: жыта, бульба, ячмень, авёс, пшаніца, грэчка, гарох. У паўд. паветах вырошчвалі проса і кукурузу. Агародніцтва, садоўніцтва, пчалярства мелі падсобнае значэнне. З развіццём капіталізму пашыраліся тэхн. культуры — лён, каноплі, асабліва бульба. Пераважала трохпольная сістэма земляробства. Частка памешчыкаў і кулакоў практыкавала шматполле. Асн. прыладай ворыва была *саха*. Палеская ці літоўская саха для парнай запрэжкі вялі пашырана на Пд і ПдЗ Беларусі, аднаконная з перакладкай — у паўн.-ўсх. паветах. Аблогі аралі разаком (адрэзам). Баранавалі *валакушай* і смыкам, а на поўначы — брусковай бараной. Жалезнай *бараной* і *плугам* сялянe пачалі карыстацца ў канцы 19 ст. С.-г. машыны выкарыстоўваліся толькі ў памешчыцкіх і асобных кулацкіх гаспадарках. Адсталая тэхніка, малазямелле, перажыткі прыгонніцтва скоўвалі развіццё гаспадаркі. Сялянe жылі ў голадзе, галечы; сярэдняя працягласць жыцця 37—38 гадоў (1897). Найб. бедныя, асабліва беззямельныя, сялянe вымушаны былі ісці на заробкі ў горад, папаўняючы рады пралетарыяту. Гарадскіх рабочых жорстка эксплуатавалі капіталісты. Найб. пашыраным тыпам паселішчаў Б. былі *вёскі* і *мястэчкі*; дробная шляхта жыла ў *засценках* і ваколіцах, памешчыкі — у *фальварках*, *маёнтках* (гл. таксама *Жыллё*). На пач. 20 ст. ўзніклі хутары (14% двароў). На ПдУ Беларусі вёскі былі невялікія — 100—200 чал., на ПдЗ — 600—800 чал. і больш. Найчасцей мелі адну, радка 2—3—4 паралельныя або перакрыжаваныя вуліцы. Хаты будаваліся абапал вуліцы, у векат. мясцінах — на адзін бок, а на другім ставіліся гасп. будынкі. Сядзібы мелі вяночную (гасп. будынкі групаваліся вакол хаты) і пагонную (ставіліся ў адзін рад) формы. Хаты найчасцей дзвюхкаморныя (хата і сенцы) зрубныя, а двух- ці чатырохсхільнай (часцей на Пд і ПдЗ) страхой, пакрыты саломай, радзей гонтамі, з драўлянай (на З часта з земляной) падлогай. Адзенне Б. было пераважна з самаробнай ільняной, часткова з шарсцянной тканіны. У мужчын — вышытая кашуля, вузкія палатняныя або суконныя штаны, пояс; у жанчын — вышытая кашуля, спадніца (*андарак*, *панёва*), фартух і пояс. Пашырана безрукаўка-камізэлька ў мужчын і безрукаўка-кабат у жанчын. Мужчынскія галаўныя ўборы — *магеркі*, *брылі*, *аблавухі*, саламяныя капелюшы; жаночыя — *наміткі*, *каптуры*, хусткі. Верхняе цёплае адзенне — *світкі*, *бурносы*, *армякі*, *бараўркі*, курткі, кажухі, паўкажухі, жупаны і інш. Абуткам служылі лыкавыя або лазовыя *лапці*, *коверані*, заможныя сяляне насілі боты (гл. таксама *Адзенне*, *Абутак*). Бел. нар. кухня вызначалася мноствам самабытных страў з мукі, круп, бульбы, агародніны, садавіны, ягад (гл. *Беларускія народныя стравы*). Грамадскі і сямейны побыт Б. быў аблытаны сеткай патрыярхальных перажыткаў. Афіц. рэлігія большасці Б. — праваслаўе. Былі і каталікі (найбольш на З Беларусі). Пасля Брэсцкай уніі 1596 і да 1839 частка насельніцтва вызнавала *уніяцтва*. Аднак Б. і ў мінулым характэрны стыхійны атэізм, які ярка выяўляўся ў антырэлігійных казках, песнях, прыказках і прымаўках. З ростам рэвалюц. руху і самасвядомасці нар. мас антырэліг. настроенасць Б. мацнела.

Культура. На працягу гістар. развіцця Б. стварылі нац. самабытную культуру, якая развівалася ў цеснай сувязі з культурамі рус. і ўкр. народаў. У нар. творчасці Б. багаты паэт. і муз. фальклор, танцы *(«Лявоніха», «Крыжачок», «Юрачка», «Янка», «Лянок», «Мяцеліца»)*. Нар. музычныя інструменты Б.— *цымбалы*, *гуслі*, *ліра*, *дуда*, *басэтля*, *бубен*, *жалейка*. Высокага майстэрства дасягнулі Б. ў выяўл. мастацтве, асабліва ў ткацтве, вышыўцы, разьбе па дрэве, драўлянай скульптуры. На Палессі вядомыя маст. керамічныя вырабы з чорнай і белай гліны, распісныя куфры. Сусветна вядомымі сталі *слуцкія паясы*. Значнай з'явай у бел. культуры 19 ст. з'явіліся анапімныя паэмы *«Тарас на Парнасе»* і *«Энеіда навыварат»*, пастаноўка першай бел. оперы «Сялянка» (муз. С. *Манюшкі*, лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча). З асяроддзя Б. у 19 — пач. 20 ст. выйшлі выдатныя пісьменнікі Янка *Купала*, Якуб *Колас*, В. *Дунін-Марцінкевіч*, Ф. *Багушэвіч*, М. *Багдановіч*, *Цёткa* (А. Пашкевіч); вядомыя артысты і кампазітары А. *Абрамовіч*, *Азарэвічы*, І. *Буйніцкі*, К. *Буткевіч*; мастакі В. *Ваньковіч*, *Гарайскія*, С. *Заранка*,

Жанчыны ў святочным убранні. Пач. 20 ст., в. Лучыцы Мазырскага пав.



І. *Хруцкі*, Н. *Сілівановіч*; вучоныя і грамадскія дзеячы І. *Дамейка*, Я. Ф. *Карскі*, І. І. *Насовіч*, М. Я. *Нікіфароўскі*, А. Я. *Багдановіч*, Е. Р. *Раманаў*, А. П. *Сапуноў*, Я. П. *Алонаў*, А. І. *Вільківіцкі*, І. А. *Гашкевіч*, М. К. *Судзілоўскі*, А. К. *Сержпутоўскі*, І. Дз. *Чэрскі*, З. *Даленга-Хадакоўскі*, М. А. *Янчук*, Я. П. *Тышкевіч* і К. П. *Тышкевіч*, Ф. *Савіч*, К. А. *Касовіч*, А. К. *Кіркор*.

Рэвалюцыйны рух. Працэс фарміравання нацыі суправаджаўся ростам нац. самасвядомасці і нац.-вызв. руху. У. І. Ленін у 1916 пісаў: «Для ўкраінцаў і беларусаў, напрыклад, толькі чалавек, які ў марах жыве на Марсе, мог бы адмаўляць, што тут няма яшчэ завяршэння нацыянальнага руху, што прабуджэнне мас да ўладання роднай мовай і яе літаратурай — (а гэта неабходная ўмова і спадарожнік поўнага развіцця капіталізму, поўнага пранікнення абмену да апошняй сялянскай сям'і) — тут я шчэ адбываецца. «Бацькаўшчына» тут я шчэ не адсвавала ўсёй сваёй гістарычнай песні» (Тв., т. 23, с. 27—28). У перыяд развіцця капіталізму абвастраецца нац.-вызв. і класавая барацьба працоўных Беларусі, разгортваецца рабочы рух. У 80-я г. пачынаецца забастовачны рух, стваруюцца рабочыя гурткі. З канца 90-х г. пад уплывам рэвалюц. сацыял-дэмакратаў рабочы рух набывае арганізаваны характар, а з пач. 20 ст. пераходзіць у масавую палiт. барацьбу супраць самаўладдзя і буржуазіі. У 1898 у Мінску адбыўся *Першы з'езд РСДРП*. Дзейнасць с.-д. арг-цый, якія існавалі амаль ва ўсіх гарадах і больших мястэчках Беларусі, узначальвалі *Паўночна-Заходні камітэт РСДРП* і *Палескі камітэт РСДРП(б)*. Працоўныя Беларусі разам з гераічным рус. пралетарыятам пад кіраўніцтвам Камуніст. партыі вялі рашучую барацьбу супраць царызму і эксплуататараў, за сваё сац. і нац. вызваленне. Пад кіраўніцтвам бальшавікоў Беларусі працоўныя актыўна ўдзельнічалі ў *рэвалюцыі 1905—07 у Расіі*, у *Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917*, у *Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі*.

Фарміраванне беларускай сацыялістычнай нацыі. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы. Стварэнне БССР. Вялікая Кастр. сацыяліст. рэвалюцыя, якая знішчыла эксплуататарскі бурж.-памешчыцкі лад, вызваліла народы б. царскай Расіі ад сац. і нац. прыгнёту, карэнным чынам змяніла і лёс Б., адкрыла неабмежаваныя магчымасці для развіцця эканомікі, нац. па форме і сацыяліст. па змесце культуры, абудзіла да творчага жыцця самыя шырокія слаі працоўных. Бел. народ пад кіраўніцтвам Камуніст. партыі і яе геніяльнага правадыра У. І. Леніна з братэрскай дапамогай рус. і інш. народаў Сав. Расіі ў жорсткай барацьбе супраць белагвардзейцаў, інтэрвентаў, бурж. нацыяналістаў заваяваў і адстаяў свабоду і незалежнасць, права «людзьмі звацца», права на буд-ва свабоднага сацыяліст. жыцця (гл. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20, Партызанскі рух на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны*). Б. ўпершыню ў гісторыі стварылі сваю дзяржаву — Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (БССР), якая з 30.12.1922 добраахвотна ўваходзіць у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). Усе гэтыя найважнейшыя падзеі зрабілі працоўны народ Беларусі сапраўдным творцам свайго шчасця, свайго лёсу, забяспечылі яму сапраўдную свабоду і нац. незалежнасць, неабмежаваныя магчымасці для грамадска-палiт., эканам. і культ. развіцця. У выніку ажыццяўлення ленінскай палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі с. гасп. Беларусь стала індустрыяльна-калгаснай рэспублікай. Але частка Б. паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* у складзе *Заходняй Беларусі* амаль на 20 гадоў трапіла пад прыгнёт бурж. Польшчы. Толькі пасля *ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржаве* (1939) насельніцтва б. Зах. Беларусі ўключылася ў сацыяліст. буд-ва, завяршылася тэрытарыяльная кансалідацыя бел. нацыі. У працэсе сацыяліст. буд-ва бел. бурж. нацыя ператварылася ў сацыяліст. нацыю. Народы СССР аб'яднаны ленінскімі інтэрнацыянальнымі ідэямі раўнапраўя, братняй садружнасці, супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі ў барацьбе за агульную справу — камунізм. На аснове сацыяліст. пераўтварэнняў у БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, карэнным чынам змяніліся сац. структура і прафесійны склад насельніцтва. У сац. адносінах Б. з'яўляюцца грамадствам з дружалюбных раўнапраўных класаў — рабочага класа, калгаснага сялянства, а таксама сав. інтэлігенцыі, што выйшла з іх асяроддзя. Кіруючай і накіроўваючай сілай ва ўсіх сферах жыцця сацыяліст. грамадства з'яўляецца Камуніст. партыя. За гады Сав. улады бел. народ дамогся велізарных поспехаў у паліт., эканам. і культ. развіцці.

Удзел беларусаў у Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза 1941—45. Шмат няшчасцяў і пакут прынеслі бел. народу ням. фашысты ў Вял. Айч. вайну. Гітлераўцы ўстанавілі на



Маладыя рабочыя Мінскага маторнага завода.

Беларусі жорсткі *акупацыйны рэжым*, прычынілі незлічоныя страты эканоміцы і культуры бел. народа. За гады акупацыі фашысты загубілі на Беларусі больш за 2200 тыс. чал.— загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі, вывезлі на катаржныя работы ў Германію каля 380 тыс. чал. Каб дурхоўна запяволіць бел. народ, фашысты бязлітасна знішчалі яго нац. культ. спадчыну, дзеячаў культуры, інтэлігенцыю. Яны знішчылі больш за палову нац. багацця бел. народа, зруйнавалі і спалілі 9200 нас. пунктаў, пакінуўшы без жылля больш за 3 млн. чал., амаль усе прамысл. прадпрыемствы, разбурылі і абрабавалі ўсе ўстановы навукі і культуры, помнікі гісторыі, мастацтва, архітэктуры. Але крывавы акупацыйны рэжым не зламаў волі бел. народа. Больш за 1 млн. Б. змагалася супраць ням.-фаш. захопнікаў на франтах Вял. Айч. вайны. На тэр. Беларусі з фашыстамі вялі барацьбу 374 тыс. партызанаў, аб'яднаных у 1108 атрадаў, 199 брыгад; у антыфашысцкім партыйна-патрыятычным і камсамольскім падполлі — больш як 70 тыс. чал. Больш за 400 тыс. чал. складалі партыз. рэзервы, якія знаходзіліся на баявым уліку ў брыгадах і атрадах і ўдзельнічалі ў партыз. барацьбе. Партызаны і падпольшчыкі знішчалі жывую сілу і ваен. тэхніку ворага, падрывалі масты, склады, ваен. аб'екты, гарнізоны, штабы, зрывалі ваенныя, эканам. і паліт. мерапрыемствы гітлераўцаў. Яны змагаліся супраць карных экспедыцый, бралі пад абарону мірных жыхароў, ратуючы іх ад смерці, рабавання і вывазу на катаржныя работы ў Германію (гл. *Партызанскі рух на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны*). За мужнасць і гераізм у барацьбе з ворагам больш як 300 тыс. воінаў-Б. і 120 тыс. партызанаў і падпольшчыкаў Беларусі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі; 467 воінам, партызанам і падпольшчыкам прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Сярод слаўных сыноў і дачок бел. народа, якія ўпісалі гераічныя старонкі ў летапіс усенароднай барацьбы супраць фаш. захопнікаў у гады Вял. Айч. вайны, легендарныя Героі Сав. Саюза К. П. *Арлоўскі*, Дз. Я. *Аскаленка*, М. Ф. *Гастэла*, Ц. П. *Бухаўкой*, А. К. *Гаравец*, Л. М. *Даватар*, В. І. *Драздовіч*, К. С. *Заслонаў*, І. К. *Кабушкін*, В. І. *Казлоў*, П. І. *Купрыянаў*, І. П. *Кожар*, В. З. *Корж*, М. А. *Кедышка*, У. Е. *Лабанок*, М. Ф. *Сільніцкі*, Ф. А. *Смалячкоў*, А. К. *Стэмпкоўская*, З. М. *Марчанка-Тусналобава*, В. З. *Харужая*, М. П. *Шмыроў*. Сярод Б. 5 чал. двойчы Герои Сав. Саюза: П. Я. *Галавачоў*, С. І. *Грыцавец*, І. І. *Гусакоўскі*, С. Ф. *Шутаў*, І. І. *Якубоўскі*. Легендарнымі сталі і імёны змагароў з ням.-фаш. захопнікамі В. П. *Драгда*, В. І. *Талаша*, братоў Міхаіла і Івана *Цубаў*; пілнераў-герояў Марата *Казея*, Міколы *Гойшыка*, Ціхана *Барана*.

Заняткі, побыт. У выніку перамогі сацыялізма Беларусь стала індустрыяльна-калгаснай рэспублікай. Яе індустрыяльная аснова — машына- і станкабудаванне, хім. прамысловасць, энергетыка. У 1969 валавая прадукцыя прамысловасці перавысіла ўзровень 1913 у 90 разоў. Рэспубліка выпускае кожны 6-ы савецкі трактар, 8-ы металарэзны станок, 5-ы матацыкл, 14-я радыёпрыёмнік і радыёлу, 12-ы тэлевізар, 17-ы грузавы аўтамабіль. Беларусь мае таксама развітую нафтаперапрацоўчую і нафтаздабываючую, лёгкую, харчовую, шкляную, дрэваапрацоўчую і будаўнічых матэрыялаў прамысловасць.




Зборшчыцы
Мінскага гадзіннікавага завода.

Прадукцыя рэспублікі вывозіцца ў 80 краін свету. Па вытворчасці на душу насельніцтва трактароў (без садова-агародных) БССР апярэдзіла ЗША, Англію, Францыю, ФРГ, Італію; металарэзных станкоў — Англію, Францыю, ЗША; тэлевізараў і радыёпрыёмнікаў — Францыю і Англію; малака — Італію, ФРГ, Англію. На аснове перадавой навукі і тэхнікі створана высокаразвітая с. гасп., якая спецыялізуецца на вытворчасці малака, мяса, бульбы і лёну. Вызначальная галіна — жывёлагадоўля. У параўнанні з 1913 вытворчасць мяса павялічылася ў 3,1 раза, малака ў 3,7 раза. Сярод саюзных рэспублік па вытворчасці льнопрадукцыі БССР займае 2-е месца, па вытворчасці бульбы і колькасці свіней — 3-е, буйн. раг. жывёлы — 4-е месца. Развіты садоўніцтва, агародніцтва, пчалярства, падсобныя промыслы. Сацыяліст. пераўтворанні рэзка змянілі матэрыяльнае жыццё Б. Толькі за 1955—69 новыя кватэры атрымала і палепшыла жыллёвыя ўмовы больш за палову насельніцтва БССР. Па тэмпах жыллёвага будаўніцтва БССР апярэджвае ЗША, Англію, Італію, Францыю. Выраслі, папрыгажэлі, добраўпарадкаваны або поўнасцю рэканструяваны гарады; узніклі новыя прамысл. цэнтры — Салігорск, Наваполацк, Светлагорск, Белаазёрск, Новалукомль, Жодзіна. У БССР (1970) 81 горад і 122 пасёлкі гар. тыпу. Змянілася аблічча вёсак. Ажыццяўляецца план пабудовы каля 6 тыс. пасёлкаў гар. тыпу замест дробных вёсак, якія існуюць. Пасёлкі забудоўваюцца планава шматкватэрнымі мураванымі дамамі і катэджамі з усімі бытавымі выгодамі, маюць школы, клубы, б-кі, гандл. цэнтры, аддз. сувязі, камбінаты быт. абслугоўвання. Вёскі Беларусі электрыфікаваны, радыёфікаваны, тэлефанізаваны. На пач. 1970 газіфікавана 79 гарадоў, 93 пас. гар. тыпу і 2671 вёска. На ўсёй тэр. рэспублікі прымаюцца праграмы Бел. і Цэнтр. тэлебачання. Знікае розніца ў адзенні сялян і гараджан. Узоры сучаснага

адзення ствараюцца на аснове выкарыстання нац. элементаў. Павышаецца жыццёвы ўзровень Б. Рэальныя даходы насельніцтва БССР за 1965—69 выраслі на 26%. Многа выплат і льгот ідзе з грамадскіх фондаў спажывання (бясплатная мед. дапамога, адукацыя, стыпендыі, пенсійнае забеспячэнне). З ростам рэальных даходаў, паляпшэннем гандл. і быт. абслугоўвання насельніцтва павялічваюцца пакупная здольнасць і спажыванне, узбагачаецца нац. кухня (гл. *Гандаль, Дабрабыт*). У БССР, як і ва ўсім СССР, вызначаны значна меншы пенсійны ўзрост, чым у ЗША, ФРГ, Швецыі і інш. капіталіст. краінах. Рост дабрабыту станоўча адбіваецца на працягласці жыцця працоўных. На Беларусі смяротнасць насельніцтва ў 1966 у параўнанні з 1913 знізілася у 3,4 раза; сярэдняя працягласць жыцця 73 гады — адна з самых высокіх у свеце. Новаму сац. ўкладу характэрныя калектывізм, узаемавыручка, агульнасць асабістых і грамадскіх інтарэсаў. Ва ўмовах сацыяліст. ладу склаліся новыя сямейныя адносіны з раўнапраўным становішчам усіх членаў сям'і. Узніклі свабодныя ад рэлігіі сав. абрады, у якіх зберагаюцца лепшыя нар. традыцыі. Найб. поўнае развіццё пры сацыялізме атрымалі нац. і інтэрнацыянальныя рысы характару Б. Развіццё культуры і навукі, рост дабрабыту Б. садзейнічалі масаваму адыходу працоўных ад рэлігіі.

Развіццё беларускай культуры. Вялікіх поспехаў дамагліся Б. ў развіцці навукі і культуры. Да Кастр. рэв. пераважная большасць Б. была непісьменная, з 1935 Беларусь — рэспубліка суцэльнай пісьменнасці. Сфарміраваліся кваліфікаваныя нац. кадры рабочага класа і нар. інтэлігенцыі, створаны ВНУ, навуч. і культ.-асветныя ўстановы. У 1969/70 навуч. г. ў БССР 11 660 агульнаадук. школ, у якіх навучалася 1 852 232 чал.; працавалі 109 945 настаўнікаў. У параўнанні з 1914/15 навуч. г. колькасць навучэнцаў агульнаадук. школ павялічылася ў 6,4 раза,

На лекцыі ў БДУ імя У. І. Леніна.





Акадэмік АН БССР М. А. Барысевіч (злева) у лабараторыі інфрачырвоных прамянёў Інстытута фізікі АН БССР.

колькасць настаўнікаў у 8,5 раза. У БССР 131 сярэдняя спец. навуч. ўстанова, у якіх 144,4 тыс. студэнтаў (1970) (больш, чым ва ўсёй дарэвалюц. Расіі). У рэспубліцы 28 ВНУ (у т. л. 2 ун-ты), у якіх у 1970 вучылася па 170 спецыяльнасцях 137,3 тыс. студэнтаў (больш, чым ва ўсёй царскай Расіі, і ў 6 разоў больш, чым было ў БССР у 1940/41 навуч. г.). Па колькасці навучэнцаў на 10 тыс. насельніцтва БССР апярэдзіла Англію, Францыю, ФРГ, Японію, Італію. У Беларусі працуе больш за 490 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй (у 2,5 раза больш, чым ва ўсёй Расіі ў 1913) (гл. табліцы 3, 4, 5). Велізарных поспехаў дамогся бел. народ у галіне навукі. У рэспубліцы 173 н.-д. ўстановы, вядучы навук. цэнтр — *Акадэмія навук*

Табліца 3.

Узровень адукацыі беларусаў у 1939* і 1959

	На 1000 чал. маюць вышэйшую і сярэднюю адукацыю, уключаючы няпоўную сярэднюю			1959 да 1939 (разоў)
	1939	1959		
	усё насельніцтва	усё насельніцтва	якое мае занятак	
Гарадское і сельскае насельніцтва				
абодва полы	75	247	341	3,3
мужчыны	95	267	364	2,8
жанчыны	56	230	319	4,1
Гарадское насельніцтва				
абодва полы	213	405	544	1,9
мужчыны	241	411	520	1,7
жанчыны	184	399	572	2,2
Сельскае насельніцтва				
абодва полы	38	172	246	4,5
мужчыны	54	194	279	3,6
жанчыны	24	153	217	6,4

* Звесткі за 1939 падаюцца на тэр. БССР у межах да 17.9.1939.

БССР. У СССР 16 358 (пач. 1969) навук. супрацоўнікаў бел. нацыянальнасці. Бел. народ даў вядомых вучоных, якія сваімі працамі зрабілі значны ўклад у развіццё сав. і сусв. навукі: П. І. *Альсмік*, М. А. *Барысевіч*, Ц. М. *Годнеў*, П. В. *Горын*, М. І. *Грашчанкаў*, Г. І. *Гарэцкі*, А. Р. *Жэбрак*, В. Ф. *Купрэвіч*, М. К. *Курака*, І. С. *Лупіновіч*, М. Дз. *Несцяровіч*, А. Я. *Пракапчук*, А. Н. *Сеўчанка*, Б. А. *Тарашкевіч*, Б. І. *Трусевіч*, Ф. І. *Фёдараў*, Г. А. *Цітай*, І. Д. *Юркевіч*.

Табліца 4.

Рост колькасці беларусаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, занятых у народнай гаспадарцы СССР (тыс. чал.)

	З вышэйшай адукацыяй	З сярэдняй спецыяльнай адукацыяй
На 1.12.1957	71,6	125,1
На 1.12.1960	95,1	162,6
На 15.11.1966	148,0	254,4

За гады Сав. улады расквітнела бел. нац. культура. Далёка за межамі рэспублікі вядомыя калектывы: Акадэм. харавая капэла БССР, Нар. хор БССР, Ансамбль танца БССР, Нар. аркестр БССР, Сімфанічны аркестр БССР. У БССР 13 тэатраў, у т. л. оперы і балета, беларускія тэатры імя Я. Купалы і імя Я. Коласа, юнага гледача, лялек, 8 абл. тэатраў; 2 філармоніі, рэсп. цыркавы калектыў, хор і эстрадны аркестр Беларускага радыё і тэлебачання; каля 30 тыс. клубаў, Палацаў і Дамоў культуры, Палацаў спорту, больш за 23 тыс. гурткоў і калектываў маст. самадзейнасці (больш за 360 тыс. чал.), 65 з іх нададзена найменне народных. У Сав. Беларусі развіваецца нар. паэтычнае, песенна-музычнае, інструментальнае, харэаграфічнае, прыкладное мастацтва, ткацтва, вышыванне, пляценне, маст. апрацоўка драўніны, кераміка. Традыцыйныя маст. промыслы Б. удаскапальваюцца і выкарыстоўваюцца мясцовай прамысловасцю. Сучасная нар. творчасць развівае нар. традыцыі, адлюстроўвае гераічнае мінулае бел. народа і яго сённяшні дзень. Творы майстроў бел. л-ры і мастацтва заслужылі шырокае прызнанне і за межамі БССР. Саюз пісьменнікаў БССР аб'ядноўвае 265 чал. Вядомы нар. паэты БССР Я. *Купала*, Я. *Колас*, П. *Броўка*, А. *Куляшоў*, М. *Танк*; нар. пісьменнікі К. *Крапіва*, М. *Лынькоў*; пісьменнікі і паэты К. *Чорны*, Ц. *Гартны*, П. *Галавач*, П. *Глебка*, М. *Зарэцкі*, М. *Чарот*, П. *Панчанка*, Я. *Брыль*, І. *Мележ*, І. *Шамякін*. На Беларусі выдаецца 230 газет і часопісаў; Саюз журналістаў аб'ядноўвае 1386 чл. У Саюзе кампазітараў БССР 42 чл. У ліку вядомых кампазітараў А. *Багатыроў*, Р. *Пукст*, Н. *Сакалоўскі*, У. *Алоўнікаў*. Саюз мастакоў БССР аб'ядноўвае 316 чл., Саюз архітэктараў БССР 328. Сярод вядомых мастакоў, скульптараў і архітэктараў В. *Бялыніцкі-Біруля*, І. *Ахрэмчык*, А. *Бембель*, В. *Цвірка*, У. *Кароль*, М. *Савіцкі*. У Беларускім тэатральным аб'яднанні больш за 1200 членаў, у Саюзе кінематаграфістаў — 109 чл. Нар. артысты СССР: Л. *Александроўская*, Б. *Платонаў*, Л. *Ржэцкая*, У. *Уладамірскі*, Р. *Шырма*, Г. *Цітовіч*, І. *Жыновіч*, З. *Стома*, П. *Малчанаў*, А. *Ільінскі*; артысты і рэжысёры Ф. і І. *Ждановічы*, У. *Галубок*, У. *Крыловіч*, К. Саннікаў (гл. *Саннікавы*), У. *Дзядзюшка*, Ю. *Тарыч*. Культура бел. сацыяліст. нацыі набыла новы сацыяліст. змест, стала глыбока інтэрнацыянальнай па сваім характары.

Табліца 5.

Узровень адукацыі беларусаў паводле асобных узроставых груп у 1958

Узроставыя групы	На 1000 чал. маюць вышэйшую і сярэднюю адукацыю, уключаючы няпоўную сярэднюю		
	гарадское і сельскае насельніцтва	у т. л.	
		гарадское	сельскае
Усё насельніцтва	247	405	172
16—19 гадоў	715	836	649
20—24 »	598	738	495
25—29 »	331	480	227
30—34 »	391	543	284
35—39 »	408	602	292
40—44 »	266	464	150
45—49 »	129	298	52
50—54 »	96	253	32
55—59 »	76	223	27
60 гадоў і больш	39	121	16

З асяроддзя бел. народа выйшлі вядомыя рэвалюцыянеры, палкаводцы, героі грамадз. вайны: П. М. *Лепяшынскі*, У. Дз. *Бонч-Бруевіч* і М. Дз. *Бонч-Бруевіч*, М. М. *Красцінскі*, У. М. *Авін*, А. Р. *Салавей*, І. П. *Убарэвіч*, І. Ф. *Блажэвіч*, М. Я. *Германовіч*, Б. С. *Гарбачоў*, П. М. *Шаранговіч*, І. Ф. *Шубін*, М. М. *Дворнікаў*, П. *Корчык* (І. К. Лагіновіч); Мадзеячы Кампартыі і Сав. дзяржавы: К. Т. *Мазурай*, П. М. *Машэраў*, С. В. *Прытыцкі*, А. А. *Грамыка*, М. В. *Зімянін*, Ц. Я. *Кісялёў*, А. Р. *Чарвякоў*, Я. А. *Адамовіч*, М. М. *Галадзед*, В. Ф. *Шаранговіч*.

Доблесная праца і ратныя подзвігі бел. народа высока адзначаны Сав. урадам: БССР узнагароджана 2 ордэнамі Леніна (1935, 1958) і ордэнам Кастр. Рэвалюцыі (1968). Усе 6 абласцей, 110 раёнаў, 9 гарадоў рэспубліканскага падпарадкавання, Брэсцкая крэпасць прысвоена ганаровае найменне «Крэпасць-герой». За выдатныя поспехі ў развіцці прамысловасці, с. гасп. і культуры 307 чал. прысвоена званне Героя Сац. Працы.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — суверэнная сацыяліст. дзяржава, неад'емная частка вял. Сав. Саюза.

Разам з інш. народамі СССР бел. народ робіць свой уклад ва ўмацаванне Сав. дзяржа-



Жаночая група Дзяржаўнага народнага хору БССР.

вы, пабудову камуніст. грамадства. БССР займае пачэснае месца на міжнар. арэне, адна з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, актыўна змагаецца за ўмацаванне міру і дружбы паміж народамі. Бел. сацыяліст. нацыя ў сваёй аснове сацыяльна аднародная, аб'яднаная грамадскай уласнасцю на сродкі вытворчасці, мае высокую эканоміку і перадавую культуру. Яна мае агульную з усімі нацыямі Сав. дзяржавы сацыяліст. радзіму — СССР, адзіную ідэалогію — марксізм-ленінізм, адзіную мэту — пабудову камунізма, адзіную кіруючую і накіроўваючую сілу — КПСС. (Пра гісторыю Б., рэвалюцыйную і нац.-вызв. барацьбу бел. народа, сацыяліст. пераўтварэнні, развіццё прамысл., с. гасп., навукі, культуры, буд-ва камунізма і інш. гл. асобны том — *Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.)*

Літ.: Ленін У. І. Крытычныя заметкі па нацыянальнаму пытанню, Тв., т. 20 (Полн. собр. соч., т. 24); Народы Европейской части СССР, т. 1, М., 1964; Очерки общей этнографии. Европейская часть СССР, М., 1968; Восточнославянский этнографический сборник, М., 1956; Карский Е. Ф. Белорусы. Язык белорусского народа, в. 1—3, М., 1955—56; Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 1—9, Киев — Вильна, 1886—1912; Сербов И. А. Белорусы-сакуны, П., 1915; Гринблат М. Я. Белорусы. Очерки происхождения и этнической истории, Мн., 1968; Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья, М., 1970; Карнейчык Я. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс, Мн., 1969; Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі, Мн., 1958; Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов, Мн., 1968; Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964; Абецедарский Л. С. Белорусы в Москве XVII в., Мн., 1957; Алексеев Л. В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии) в IX—XIII вв., М., 1966; Пичета В. И. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., М., 1961; Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в., Мн., 1966; Волбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.), Мн., 1966; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры, Мн., 1969; Грицкевич В. П. Путешествия наших земляков. Из истории страноведения Белоруссии, Мн., 1968; Гісторыя Беларускай ССР, т. 1—2, Мн., 1955—58; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, ч. 2 (1921—1966), Мн., 1967; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.), Мн., 1966; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967, Мн., 1967; Раков А. А. Население БССР, Мн., 1969; Рост материального благосостояния и культуры белорусского народа, Мн., 1969; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 1—2, Мн., 1965—66; Янкоўскі Ф. (скл.) Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы, 2 выд., Мн., 1962; яго ж. Беларуская фразеалогія, Мн., 1968; Няфёд У. Г. Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі, Мн., 1959; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969; Чурко Ю. М. Белорусский балет, Мн., 1968; яе ж. Белорусский сценический танец, Мн., 1968; Беларускія народныя песні. Sanic P. P. Шырмы, т. 1—3, Мн., 1959—62; Pietkiewicz Cz. Polesie Rzeczyckie. Materiały etnograficzne, cz. 1 — Kultura materialna, Kraków, 1928; яго ж. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego, Warszawa, 1938; Federowski M. Lud białoruski, t. 1—7, Kraków — Warszawa, 1897—1969; Шлюбскі А. (скл.) Матэрыялы да беларускай бібліяграфіі, ч. 4 — Этнаграфія, Мн., 1927; Дубінскі С. А. Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін, Мн., 1933; Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм, Мн., 1969; Русская дореволюционная книга о Белоруссии (1802—1916). Библиография, Мн., 1964; [Пенкина З. М.] Полесье. Библиографические материалы по истории, географии, статистике, этнографии и экономическому состоянию Полесья, СПб., 1883; Беларускае мовазнаўства. Бібліягр. ўказальнік (1825—1965), Мн., 1967.

А. А. Ракаў. Мінск.

БЕЛАРУСЬ, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі (з 1.1.1919) Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, сацыялістычная дзяржава рабочых і сялян, суверэнная Савецкая рэспубліка, якая з 30.12.1922 добраахвотна ўваходзіць у СССР. Першыя пасяленні чалавека на тэр. Б. вядомыя з сярэдняга палеаліту, г. зн. не менш як 100 тыс. гадоў таму назад. У 6—8 ст. на тэр. Б. вядомыя саюзы славянскіх плямён: *крывічоў* (і іх адгалінаванні — *палачан*), *дрыгавічоў*, *радзімічаў*, *бужан*; суседнія *севяране*, *драўляне*, а таксама балтыйскія плямёны *(літва, ятвягі)*, славянская асіміляцыя якіх пачалася ў гэты перыяд. У 9 ст. з утварэннем старажытнарускай дзяржавы — *Кіеўскай Русі* землі Б. ўвайшлі ў яе склад і, як і інш. тэрыторыі, мелі назву Русь. У межах гэтай дзяржавы на аснове ўсх.-славянскіх плямёнаў склалася старажытнаруская народнасць, з якой пазней утварыліся тры братнія народы: рускі, украінскі, беларускі. У час феад. раздробленасці адасобіліся Полацкае, Тураво-Пінскае, Смаленскае княствы, якія распаліся на драбнейшыя ўдзельныя княствы і землі. У той перыяд насельніцтва Б. называлася паводле гал. горада зямлі ці княства: палачане, віцябляне, мяняне, случане, тураўцы, берасцейцы і г. д. У 13—14 ст. тэр. Б. ўвайшла ў *Вялікае княства Літоўскае.* У складзе гэтай дзяржавы, а пазней і *Рэчы Паспалітай*, бел. землі мелі назву Русь і Літва. Пра гэта сведчаць тытул вялікага князя Вял. кн. Літ. («князь Літоўскае зямлі і Жамойцкае і многіх рускіх зямель») і афіц. дакументы (Літоўскі статут 1588: «а пісар земскі маець па-руску, літарамі і словы рускімі всі лісты, выпісы і позвы пісаці, а не іншым языком і словы»). З канца 14 ст. на землі Усх. Б. пашыраецца назва *Белая Русь*, якая з часам замацоўваецца ўладамі Вял. кн. Літ. Найб. верагодна, што ўпершыню тэрмін «Беларусь» ужыў у 1635 П. Магіла, называючы заснаваную ім у 1632 Мсціслаўска-Аршанска-Магілёўскую епархію: «...у року

пяцярашнім тысяча шэсцьсот трыццаць пятым, аб'ядноўваючы і навяжаючы краі Вялікага княства Літоўскага і беларускія, да епіскапіі Мсціслаўскай, Аршанскай і Магілёўскай належачыя, завіталі да ... Магілёва» («Археаграфічны зборнік дакументаў, якія адносяцца да гісторыі Паўночна-Заходняй Русі...», т. 2, Вільня, 1867, с. 57). Паступова беларускімі сталі называць і землі, на якія пашыралася ўлада гэтай епархіі. Пасля *ўз'яднання Беларусі з Расіяй* (1772—95) беларускімі называліся 2 новыя губерні — Полацкая (у 1772—76 Пскоўская) і Магілёўская, якія паводле ўказу Паўла I ад 12.12.1796 аб'яднаны *ў Беларускую губерню* з цэнтрам у Віцебску. У канцы 18 — 1-й пал. 19 ст. пад Б. разумелі Віцебскую і Магілёўскую губ., часам і Мінскую, а Гродзенскую і Віленскую, як і раней, называлі літоўскімі. Імператар Мікалай I указам ад 18.7.1840 забараніў называць Віцебскую і Магілёўскую губ. беларускімі, а Гродзенскую і Віленскую літоўскімі. Каб звіжчыць назву «Беларусь», царскія чыноўнікі з 1842 у афіц. дакументах ужывалі ў адносінах да Б. тэрміны Паўночна-Заходні край, Заходні край, Заходнія губ. (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Ковенская, Магілёўская, Мінская, Валынская, Кіеўская і Падольская; першыя 6 называліся паўн.-зах., а 3 апошнія — паўд.-зах.). У этнагр. тэрыторыю Б. на пач. 20 ст. ўключалі цалкам Магілёўскую і Мінскую губ., 6 пав. Віленскай (Ашмянскі, Вілейскі, Віленскі, Дзісенскі, Лідскі, Свянцянскі); 7 пав. Віцебскай (Віцебскі, Веліжскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Невельскі, Полацкі); 5 пав. Гродзенскай губ. (Гродзенскі, Ваўкавыскі, Пружанскі, Слонімскі, Сакольскі).

У выніку Вял. Кастр. рэвалюцыі Б. упершыню ў гісторыі атрымала сваю дзяржаўнасць. Пад кіраўніцтвам Камуніст. партыі бел. народ разам з інш. братнімі народамі пабудаваў сацыялізм і паспяхова будуе камунізм. (Падрабязныя звесткі пра гісторыю Б., рэвалюц. барацьбу бел. народа, сацыяліст. пераўтварэнні, развіццё прамысловасці, с. гасп., навукі, культуры, будаўніцтва камунізма і інш. гл. ў асобным томе — *Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.)*

«БЕЛАРУСЬ», выдавецтва ў Мінску, якое выпускае палітычную, сацыяльна-эканамічную, мастацкую, дзіцячую, медыцынскую, вытворчую, даведачную, музычную літаратуру, альбомы, плакаты і інш. выданні. Да 1951 выдавала таксама навучальна-педагагічную, да 1960 сельскагаспадарчую л-ру.

Засн. ў ліст. 1920 як Бел. аддзяленне Дзярж. выдавецтва РСФСР, са студз. 1921 Дзярж. выдавецтва БССР. У першыя гады, акрамя кніг, выпускала газеты і часопісы. У снеж. 1922 увайшло ў склад Белтрэстдруку (Дзярж. трэст выд. справы і палігр. прамысловасці Беларусі). У чэрв. 1924 ЦВК і СНК БССР рэарганізавалі «Белтрэстдрук» і каап. выд. «Савецкая Беларусь» і на іх базе стварылі Бел. дзярж. выдавецтва (БДВ), перайменаванае ў 1933 у Дзярж. выдавецтва БССР (ДВБ). У час Айч. вайны в 1942 працавала ў Маскве і называлася «Савецкая Беларусь» (у снеж. 1943 зноў перайменавана ў Дзярж. выдавецтва БССР). У 1944 аднавіла дзейнасць у Мінску, у 1963 атрымала назву «Беларусь».

Выдавецтва адыграла значную ролю ў культ. буд-ве БССР, у пасляваен. аднаўленні кніжных фондаў рэспублікі і развіцці бел. кнігадрукавання. У 1946—69 выпусціла 8024 кнігі і брашуры тыражом 149 623 тыс. экз. Выдала на бел. мове «Капітал» К. Маркса, 239 кніг У. І. Леніна (да 1.1.1969, агульны тыраж 2847,2 тыс. экз.), сярод іх Творы ў 40 тамах (у пер. з 4-га рус. выдання), творы А. Пушкіна, М. Лермантава, Л. Талстога, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі, М. Горкага, У. Маякоўскага, Дж. Байрана, У. Шэкспіра, Г. Гейнэ, Ю. Славацкага, П. Ж. Беранжэ; працы па гісторыі БССР і КПБ; зборы твораў Я. Коласа, Я. Купалы, К. Чорнага, З. Бядулі, К. Крапівы, П. Броўкі, А. Куляшова, М. Лынькова, М. Танка, І. Шамякіна і інш. бел. пісьменнікаў. У розны час у выдавецтве працавалі Я. Купала, Ц. Гартны, К. Крапіва, П. Глебка, М. Клімковіч, І. Шамякін, Я. Скрыган і інш. дзеячы бел. культуры.

С. В. Марцэлеў. Мінск.

«БЕЛАРУСЬ», штомесячны ілюстраваны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс, орган Саюза пісьменнікаў БССР. Выдаецца са студз. 1944. З жн. 1947 да мая 1957 быў таксама органам Рэсп. т-ва па распаўсюджванні паліт. і навук. ведаў. У 1944 выходзіў 1 раз у 2 месяцы паралельна на бел. і рус. мовах спачатку ў Маскве (№ 1—3), потым у Мінску. З 1945 выходзіць на бел. мове. Друкуе апавяданні, вершы, аднаактовыя п'есы, нарысы, публіцыстычныя артыкулы, рэпартажы, пераклады твораў братніх л-р і прагрэс. заруб. пісьменнікаў, краязнаўчыя і інш. матэрыялы. Асвятляе гасп. і культ. будаўніцтва ў рэспубліцы, поспехі перадавікоў нова-будоўляў, фабрык, заводаў, калгасаў і саўгасаў. У «Б.» ўпершыню апублікаваны многія творы Я. Коласа, К. Крапівы, П. Броўкі, М. Лынькова, А. Куляшова, М. Танка, П. Глебкі, П. Панчанкі, У. Дубоўкі, Я. Брыля, А. Астрэйкі, А. Кулакоўскага, А. Бялевіча і інш. бел. пісьменнікаў; выступаюць вядомыя вучоныя, дзеячы мастацтва, кіраўнікі партыйных, дзярж. і грамадскіх устаноў рэспублікі. Да ліст. 1960 рэдактар І. *Гурскі*, са снеж. 1960 — М. *Калачынскі.*

І. Д. Казека. Мінск.

«БЕЛАРУСЬ КАЛГАСНАЯ», штомесячны літаратурна-мастацкі часопіс, які выдаваўся ў Мінску ў 1932 Аб'яднаннем пралетарскакалгасных пісьменнікаў Беларусі. Выйшла 8 нумароў. Тыраж 1300—1500 экз. Моў на мэце выхоўваць з асяроддзя калгаснага сялянства новых пісьменнікаў. Друкаваў творы пра сацыяліст. перабудову вёскі, жыццё калгаснікаў, саўгасаў, МТС. Сярод аўтараў — Я. Купала, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Лынькоў, С. Баранавых, М. Зарэцкі, В. Каваль, Я. Скрыган, В. Сташэўскі, У. Хадыка, К. Чорны і інш. Рэдактары: Н. Міхайлаў (№ 1—7), Р. Мурашка (№ 8).

Н. Б. Ватацы. Мінск.

БЕЛАРУСЬНАФТА, вытворчае аб'яднанне нафта-газавай прамысловасці. Створана ў 1966 для арг-цыі і развіцця нафтаздабываючай прамысл. і правядзення геолагараз-

ведачных работ на нафту і газ у БССР. Падпараджавана Гал. ўпраўленню па здабычы нафты і газу ў паўд.-зах. раёнах Мін-ва нафтаздабываючай прамысл. СССР. Размешчана ў Гомелі. У складзе Б.: нафта-газаздабываючае ўпраўленне Рэчыцанафта ў Рэчыцы, упраўленні буравых работ у Рэчыцы і Светлагорску, буд.-мантажнае ўпраўленне ў Рэчыцы, нарматыўна-даследчая станцыя і інш. Першая прамысл. здабыча нафты пачалася ў 1965 на *Рэчыцкім радовішчы нафты*. Пазней адкрыты Асташкавіцкае, Цішкаўскае, Давыдаўскае і Вішанскае радовішчы (гл. адпаведныя арт.). У 1965 здабыта 38,9 тыс. *т*, у 1966 — 207,6 тыс. *т*, у 1969 — 2760 тыс. *т*. Бел. нафта ідзе па нафтапровадзе «Дружба» ў сацыяліст. краіны і па чыгунцы на Наваполацкі нафтаперапр. з-д. Пасля ўводу ў эксплуатацыю на бел. нафце будзе працаваць Мазырскі нафтаперапр. з-д. Адначасова з нафтай здабываецца прыродны спадарожны паліўны газ, каля 95 $м^3$ на кожную тону нафты (гл. *Газы прыродныя гаручыя*). З 1967 на базе рэсурсаў спадарожнага нафтавага газу пачалося газазабеспячэнне прамысл. і камунальна-быт. прадпрыемстваў Рэчыцы. З канца 1969 нафтавы газ ідзе на паліва Васілевіцкай ДРЭС. У 1969 здабыта 24,43 млн. $м^3$ паліўнага газу.

М. М. Пісарык. Гомель.

«БЕЛАРУСЬФІЛЬМ», кінастудыя Беларускай ССР. Створана ў 1928 кінаарганізацыяй *Белдзяржкіно* ў Ленінградзе пад назвай «Савецкая Беларусь», з 1946 — «Беларусьфільм». У Мінску з 1939. У пач. 30-х г. з'явіліся гукавыя фільмы: «Першы ўзвод», «Двойчы народжаны». На «Б.» ў розны час працавалі сцэнарысты Б. Брадзянскі, А. *Вольны*, К. *Губарэвіч*, Р. *Кобец*, А. *Куляшоў*, А. *Кучар*, М. *Лужанін*, А. *Макаёнак*, А. *Маўзон*; рэжысёры Э. Аршанскі, У. Бычкоў, Р. Вінаградаў, В. Вінаградаў, Л. *Голуб*, У. *Корш-Саблін*, С. Сплашноў, Б. Сцяпанаў, Ю. *Тарыч*, В. Тураў, А. *Файнцымер*, М. *Фігуроўскі*, І. *Шульман*; аператары У. *Акуліч*, А. Аўдзееў, А. *Булінскі*, А. *Гінцбург*, А. *Забалоцкі*, С. Іваноў, А. *Кальцаты*, Ю. Марухін, Б. Рабаў, Д. Шлюглейт. Усяго студыя выпусціла больш за 100 поўнаметражных маст. фільмаў. Найбольш значныя: «Кастусь Каліноўскі», «Шукальнікі шчасця», «Балтыйцы», «Адзінаццатага ліпеня»; пасляваен.— «Канстанцін Заслонаў», «Паўлінка», «Міколка-паравоз», «Нашы суседзі», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Чырвонае лісце», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Масква — Генуя», «Праз могілкі», «Альпійская балада», «Горад майстроў», «Іван Макаравіч». У 1960 пабудавана новае памяшканне студыі. У «Б.» тры аб'яднанні: маст. фільмаў, хронік. і дакументальных — «Летапіс» і аб'яднанне тэлевізійных фільмаў.

КІНАФІЛЬМЫ
(у дужках прозвішчы сцэнарыста, рэжысёра і аператара)

1926 — «Ляснал быль» (Ю. Тарыч і М. Чарот, Тарыч, Д. Шлюглейт). 1927— «Гарадскія нядачы» (С. Мітрыч, Н. Чыкін, Я. Талчан); «Кастрычнік і буржуазны свет» (Р. Балцянскі, рэж. А. Найдзіч); «Прастытутка» (Н. Галкін і Я. Дземідовіч, А. Фрэліх, А. Вінклер). 1928—«Бунт зубоў» (рэж. В. Астроўскі, М. Казлоўскі); «Грышка-свінапас» (сцэн. і рэж.-мантаж. В. Кубліцкі); «Жывыя дамі» (М. Агніўцаў, Найдзіч, Казлоўскі); «Кастусь Каліноўскі» (сцэн. і рэж. У. Гардзін, А. Акмолінскі і Н. Антокман); «У вялікім горадзе» (М. Данской, М. Авербах і Данской, Я. Шнейдэр); «Яго ясначвільможнасць» (В. Строева і С. Рашаль, Р. Рашаль, Казлоўскі і А. Машковіч). 1929 — «Да заўтра» (І. Бахар і Тарыч, Тарыч, Шлюглейт); «Джэнтльмен і певень» (Ц. Даўгапольскі і Л. Іерыхонаў, У. Балюзак, А. Кальцаты і Казлоўскі); «Песня вясны» (Гардзін і А. Ляжневіч, Гардзін, Шлюглейт); «Хвоі гамоняць» (А. Вольны і К. Дзяржавін, Л. Малчанаў, Казлоўскі); «Чатырыста мільёнаў» (Я. Бабушкін і Гардзін, Гардзін, Шлюглейт). 1930 — «Алеся» (Л. Куляшоў, А. Леанідаў і А. Хахлова, Хахлова, Н. Навумаў-Страж); «Атэль «Савой» (А. Вольны, А. Файнцымер, Машковіч); «Нянавісць» (сцэн. і рэж. Тарыч, С. Іваноў і Б. Фельдман); «У агні народжанай» (А. Вольны, У. Корш-Саблін, Шлюглейт); «Хамелеон» (Е. Кальцова, А. Леўшын і А. Мурамскі, Леўшын, С. Файнман). 1931 — «Рубікон» (А. Менскі, У. Вайнштэк, Кальцаты); «Сапраўднае жыццё» (Л. Залкінд, А. Гаўронскі і В. Уліцкая, М. Сакалоў і Шлюглейт); «Сонечны пахоп» (А. Вольны, Корш-Саблін, Шлюглейт); «Суд павінен ісці далей» (В. Паўлоўскі, Я. Дзіган, Навумаў-Страж); «Кульгаўка» (Ю. Вінакураў і А. Крон, Вінакураў, Файнман). 1932 — «Адбітак часу» (М. Іціна, Г. Кроль, С. Забаэлаеў); «Балм насустрач» (Е. Гевін, К. Губарэвіч і К. Мінеп, Э. Аршанскі, Б. Рабаў); «Вораг калп парога» (В. Кацінаў, Л. Анцыпалоўскі, А. Рагоўскі); «Вышыня 88,5» (Ю. Берман і Б. Вярхоўскі, Тарыч, Г. Максімаў і І. Ціхаміраў); «Вяртанне Нейтана Бекера» (П. Маркіш, Р. Мільман і Б. Шпіс, Мільман і Шпіс, Я. Міхайлаў); «Гонар» (рэж. Авербах, Файнман); «Жанчына» (І. Іваноў, Дзіган, Навумаў-Страж); «Ураган» (Б. Брадзянскі і Р. Кобец, Вайнштэк, Кальцаты); «Шчасце» (В. Салаўёў, М. Таўбе і А. Файнцымер, Файнцымер, С. Іваноў). 1933 — «Гонар свету» (Брадзянскі, Вайнштэк, Кальцаты); «Першы ўзвод» (Брадзянскі, Корш-Саблін, Кальцаты і Рабаў). 1934 — «Двойчы народжаны» (Кобец, Аршанскі, Рабаў); «Паручнік Кіжэ» (Ю. Тынянаў, Файнцымер, Кальцаты); «Першае каханне» (Таўбе і В. Шрэйбер, Шрэйбер, Шлюглейт); «Хто твой сябар?» (П. Броўка, Авербах, Рагоўскі). 1935 — «Залатыя агні» (Брадзянскі, Корш-Саблін, Рабаў); «Інжынер Гоф» (М. Бальшынцоў, Мільман і Шпіс, Міхайлаў); «Новая радзіма» (А. Вольны, Аршанскі, Іваноў); «Палескія рабінзоны» (Я. Маўр, Бахар і П. Малчанаў, Іваноў); «Сталасць» (І. Зэльцэр, Шрэйбер, Шлюглейт); «Шлях карабля» (І. Сакалоў-Мікітаў, Тарыч, Кальцаты, Е. Менгдэн і М. Тэйтальбаум). 1936 — «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (А. Зорыч, М. Вернер, А. Булінскі); «Шукальнікі шчасця» (Зэльцэр і Кобец, Корш-Саблін, Рабаў). 1937 — «Балтыйцы» (А. Зіновін і А. Штэйн, Файнцымер, С. Бялаеў і Рагоўскі); «Дачка Радзімы» (Зэльцэр, Корш-Саблін, Рабаў і Я. Шапіра); «Дняпро ў агні» (І. Барашка і Кобец, Ч. Сабінскі і Я. Паўлаў, Булінскі); «Канцэрт Бетховена» (В. Пхор, М. Гаўронскі і У. Шмітгоф, В. Гарэлік, Рагоўскі і Л. Фунштэйн); «Салавей» (З. Бядуля і Таўбе, Аршанскі, Іваноў). 1938 — «Адзінаццатага ліпеня» (Зіновін і Тарыч, Тарыч, Іваноў); «Маслікова» (сцэн. і рэж. С. Сплашноў, Шлюглейт); «Мядзведзь» (сцэн. і рэж. І. Аненскі, Шапіра); «Мянтуз» (сцэн. і рэж. Сплашноў, В. Максімовіч). 1939 — «Вогненныя гады» (І. Лукоўскі і С. Наўроцкі, Корш-Саблін, К. Пагодзін); «Чалавек у футляры» (сцэн. і рэж. Аненскі, Шапіра). 1940— «Будні» (П. Голікаў і І. Главычаў, Шрэйбер, Пагодзін); «Маё каханне» (І. Прут, Корш-Саблін, Шлюглейт). 1941 — «Песня пра дружбу» (І. Бражнін, Сплашноў і І. Шапіра, Пагодзін); «Сям'я Януш» (К. Васіленка і Я. Памешчыкаў, Наўроцкі, Рабаў). 1947 — «Новы дом» (Памешчыкаў, Корш-Саблін, У. Рапапорт). 1949 — «Канстанцін Заслонаў» (А. Маўзон, Файнцымер і Корш-Саблін, А. Гінцбург). 1952 — «Паўлінка» (М. Лужанін, А. Зархі, Гінцбург). 1953 — «Пяюць жаваранкі» (К. Крапіва, Корш-Саблін і К. Саннікаў, Гінцбург). 1954 — «Дзеці партызана» (Р. Калтуноў, Д. Голуб і М. Фігуроўскі, Булінскі); «Хто смяецца апошнім» (К. Крапіва, Корш-Саблін, Гінцбург). 1955 — «Несцерка» (В. Вольскі, Зархі, Ю. Фогельман). 1956 — «Зялёныя агні» (А. Маўзон, Сплашноў і І. Шульман, Булінскі); «Пасеялі дзяўчаты лён» (Памешчыкаў, Корш-Саблін, У. Акуліч). 1957 — «Міколка-паравоз» (М. Лынькоў і М. Садковіч, Голуб, Г. Удавенкаў); «Нашы суседзі» (М. Антоненкаў і Я. Сівела, Сплашноў, Булінскі); «Палеская легенда» (А. Вітаў, П. Васілеўскі і Фігуроўскі, Акуліч). 1958 — «Шчасце трэба берагчы» (А. Макаёнак, Шульман, Удавенкаў); «Чырвонае лісце» (А. Куляшоў і А. Кучар, Корш-Саблін, Фогельман); «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (М. Фігуроўскі і А. Кучар, Фігуроўскі, Акуліч). 1959 — «Дзяўчынка шукае бацьку» (К. Губарэвіч і Я. Рыс, Голуб, А. Аўдзееў і І. Пікман); «Строгая жанчына» (М. Блісцінаў, Шульман, Удавенкаў). 1960 — «Веснавыя навальніцы» (сцэн. і рэж. Фігуроўскі, Акуліч); «Каханнем трэба даражыць» (М. Бярозка і Сплашноў, Сплашноў, Аўдзееў); «Наперадзе — круты паварот» (А. Маўзон, Р. Вікцітара, Пікман); «Першыя выпрабаванні» (1-я серыя, Куляшоў і М. Лужанін, Корш-Саблін, Булінскі). 1961 — «Апавяданні пра юнацтва» (Фігуроўскі, Васілеўскі, У. Караткевіч і А. Ястрабаў, Б. Сцяпанаў, В. Тураў, С. Браўдэ і Л. Дурасаў, Аўдзееў, А. Забалоцкі, І. Рамішэўскі і Пікман); «Чалавек не здаецца» (І. Стаднюк, Шульман, Акуліч); «Першыя выпрабаванні» (2-я серыя, А. Куляшоў і М. Лужанін, Корш-Саблін, Булінскі). 1962 — «Дзень, калі мінае 30 гадоў» (А. Каплінская, В. Вінаградаў, Аўдзееў); «Вуліца малодшага сына» (Л. Касіль і М. Паляноўскі, Голуб, Пікман). 1963 — «Маленькія летуценнікі» (Н. Марозава, У. Марозаў, Каплінская, Л. Неменава і Г. Шпалікаў, А. Грачыха, Тураў і Ястрабаў, Рамішэўскі, Удавенкаў і Забалоцкі); «Апошні хлеб» (В. Трунін, Сцяпанаў, Забалоцкі і Ю. Марухін); «Трэцяя ракета» (В. Быкаў, Віктараў, А. Кірылаў і М. Хубаў). 1964 — «Увага, у горадзе чарапнікі» (В. Вітковіч і Г. Ягфельд, У. Бычкоў, М. Кожын); «Масква — Генуя» (А. Спешнеў, Спешнеў з удзелам Корш-Саблінa і П. Арманда, Булінскі); «40 мінут да світання» (Р. Вікерс і А. Канеўскі, Б. Рыцараў, Пікман). 1965 — «Рагаты бастыён» (Макаёнак, Васілеўскі, Акуліч і У. Арлоў); «Крыніцы» (І. Шамякін, Шульман, Аўдзееў); «Каханая» (А. Стукалаў, Віктараў, Марухін); «Праз могілкі» (П. Нілін, Тураў, Забалоцкі); «Лісты да жывых» (А. Кучар, Вінаградаў, М. Арлаб'еўскі і А. Княжынскі); «Горад майстроў» (М. Ярдман, Бычкоў, Ардаб'еўскі і Княжынскі); «Пушчык едзе ў Прагу» (Ю. Якаўлеў і М. Плахетка, Голуб, Удавенкаў). 1966 — «Іду шукаць» (А. Аграновскі і М. Анчараў, І. Дабралюбаў, Рамішэўскі і Ю. Цвяткоў); «Чужое імя» (М. Блейман, А. Вакселр і М. Баран, Шульман, Аўдзееў); «Альпійская балада» (Быкаў, Сцяпанаў, Забалоцкі); «Колькі лет, колькі зім» (сцэн. і рэж. Фігуроўскі, А. Кірылаў). 1967 — «Я родам з дзяцінства» (Шпалікаў, Тураў, Княжынскі); «Запомнім гэты дзень» (А. Куляшоў і М. Лужанін, Корш-Саблін, Фогельман); «Саша-Сашачка» (Л. Вакуловская, В. Чацверыкоў, Рамішэўскі). 1968 — «Усходні калідор» (А. Кучар і Вінаградаў, Вінаградаў, Марухін); «Тысяча вокнаў» (сцэн. і рэж. Спешнеў, Булінскі); «Анюціна дарога» (Губарэвіч, Голуб, Цвяткоў); «Вайна над стрэхамі» (А. Адамовіч, Тураў, С. Пятроўскі); «Іван Макаравіч» (В. Сачанка, Дабралюбаў, Дз. Зайцаў). 1969— «І ніхто іншы» (С. Нагорны, Шульман, Ю. Сокал); «Прыгодны да нестраявой» (Я. Сівела, У. Рагавой, В. Нікалаеў); «Дзесятая доля дарогі» (С. Кара, Ю. Дубровін, Акуліч); «Чакай мяне, Ганна» (Ю. Нагібін, Вінаградаў, Марухін); «Стварыць бой» (Ю. Лакербай, М. Калінін, Аўдзееў), 1970 — «Я, Францыск Скарына» (Садковіч і М. Львоў, Сцяпанаў, Нікалаеў); «Мы з Вулканам» (Якаўлеў, В. Пяроў, Рамішэўскі).

Літ.: История белорусского кино (1924—1945), Мн., 1969; Красінскі А. В., Смаль В. І. і Тарасевіч Г. П. Беларускае кіно. Кароткі нарыс, Мн., 1962; История белорусского кино (1945—67), Мн., 1970 [у друку]; Проблемы современного белорусского искусства, Мн., 1968.

В. І. Смаль. Мінск.

БЕЛАРЫБІЦА (Stenodus leucichthys), рыба сямейства ласасёвых, каспійскі падвід нельмы. Даўж. каля 1 *м*, маса да 20 *кг*. Водзіцца ў Каспійскім м., куды займла ў ледавіковы час з Ледавітага ак. Трымаецца ў халодных слаях вады. Корміцца рыбай. Калі дасягае полавай спеласці (5—7 гадоў), ідзе на Пн, у рэкі Волгу і Урал. Гал. месцы нерасту на р. Уфе (300 *км* ад мора). У час міграцый не корміцца. Плоднасць 250 000 ікрынак. Б.— каштоўны аб'ект промыслу.

БЕЛАСАРОКА, паселішча эпохі мезаліту (8—5-е тысячагоддзі да н. э.). Размешчана на першай надпоймавай тэрасе Прыпяці, каля в. Беласарока Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. Даследавалася У. Ф. Ісаенкам у 1962. Пры раскопках знойдзены каменныя прылады працы з прамавугольнымі і трохвугольнымі ўстаўкамі-мікралітамі, вастрыі, скрабкі, наканечнікі, пласцінкі. Выяўленыя рэчы характэрны *мікралітычнай культуры* Палесся. Насельніцтва займалася паляваннем і рыбалоўствам.

Літ.: Исаенко В. Ф. Мезолит Восточного Полесья, у кн.: Вопросы истории и археологии, Мн., 1966.

БЕЛАСПОН, лякарства. Мае эргатамін, радабелін і люмінал. Заспакойвае цэнтральную нервовую сістэму і нармалізуе тонус вегетатыўнай нервовай сістэмы. Ужываецца ўнутр (у выглядзе дражэ) ад неўрозаў, мігрэні, хваробы Меньера, гіпертанічнай, алергічных і хвароб страўнікава-кішачнага тракту. Вырабляецца ў ЧССР.

БЕЛАСТОК (Białystok), горад на ПнУ Польшчы, на р. Бяла. Адм. ц. Беластоцкага ваяводства. Чыг. вузел. 159 тыс. ж. (1968).

Заснаваны, напэўна, у 14 ст. У 1749 атрымаў права горада. Паводле Тызьзіцкага дагавору (гл. *Тызьзіцкі мір 1807*) адышоў да Расіі. Рабочыя Б. актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюц. выступленнях супраць царызму ў 1905—07. У 1-ю сусв. вайну заняты немцамі. У 1920—39 ачаг рэвалюц. рабочага руху (вялікія стачкі 1923, 1934). Да 1925 тут знаходзіўся ЦК КПЗБ. У вер. 1939 вызвалены Чырв. Арміяй. З 4.12.1939 цэнтр *Беластоцкай вобласці* БССР. У 1941 акупаваны гітлераўцамі. Вызвалены Сав. Арміяй 27.7.1944. У вер. 1944 увайшоў у склад Польскай Нарсдпай Рэспублікі.

Б. — цэнтр тэкст. (шарсцяной і бавоўнянай) прамысловасці. Прадпрыемствы дакладнага машынабудавання, металаапр., дрэваапр., хім., гарбарнай, шкларобнай, харч. прамысловасці. Мед. акадэмія, вячэрні інж. ін-т. Тэатр. У Б. знаходзіцца *Беларускае грамадска-культурнае таварыства* (БГКТ).

Літ.: Studia i materiały do dziejów miasta Białegostoku, t. 1, Białystok, 1968.

БЕЛАСТОЦКАЕ ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, злучэнне партызанскіх брыгад і атрадаў, якія змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэр. акупаванай Беластоцкай вобл. Створана ў ліп. 1943 паводле рашэння ЦК КП(б)Б і Цэнтр. штаба партыз. руху (ЦШПР). Узначальваў першы сакратар *Беластоцкага падпольнага абкома КП(б)Б* В. Е. *Самуцін*, нач. штаба ген.-м. П. П. *Капуста*, нам. нач. штаба І. А. Слынькевіч. Летам 1943 з *Мінскага партызанскага злучэння* для перадыслакацыі ў Беластоцкую вобл. бы-

ла вылучана група атрадаў: імя Будзённага, «За Радзіму», «Баявы», імя Аляксандра Неўскага, імя Жукава (усяго разам са штабам 744 чал.). Атрады на чале з Беластоцкім падпольным абкомам КП(б)Б і абл. штабам партыз. руху за 68 дзён зрабілі з баямі 1000-кіламетровы рэйд па тыле ворага. У час рэйду да групы далучылася *партызанская брыгада імя В. І. Чапаева* (439 чал.). Абком і абласны штаб трымалі радыёсувязь з ЦК КП(б)Б і ЦШПР, інфармавалі іх пра становішча на акупаванай тэр., перадавалі звесткі разведкі, прымалі самалёты са зброяй і боепрыпасамі. 1.11.1943 злучэнне прыбыло ў Ліпічанскую пушчу на тэр. Шчучынскага р-на. Рэйд меў вялікае значэнне для актывізацыі партыз. барацьбы мясц. насельніцтва. У склад Б. п. з. ўліліся мясц. партыз. атрады: Вайцяхоўскага, імя Калініна; групы Аўдоніна, Казакова, Сямашкі (усяго 401 чал.). На апошнім этапе рэйду 14—18.11.1943 (Ліпічанская і Гродзенская пушчы) байцы злучэння вялі цяжкія баі з ням. акупантамі, якія кінулі супраць партызанаў больш за 6 тыс. салдатаў і афіцэраў рэгулярнай арміі з танкамі, бронемашынамі, артылерыяй і самалётамі. Найбольш цяжкія баі адбыліся каля вёсак Зенякі, Карпонаўцы, Зубрава, пры пераходзе цераз дарогу Бершты — Новы Двор, на р. Котра, каля Святога балота Гродзенскага, Мастоўскага, Шчучынскага і Скідальскага р-наў. У гэтых баях партызаны знішчылі звыш 700 салдат і афіцэраў ворага.

На час злучэння з Сав. Арміяй (ліп. 1944) у складзе В. п. з. налічвалася 4165 узброеных партызанаў, аб'яднаных у 5 брыгад: «У імя Радзімы», імя Чапаева, імя Кастуся Каліноўскага, імя Аляксандра Неўскага, імя Панамарэнкі і 7 асобна дзейных атрадаў: «Баявы» імя Дунаева, імя Калініна, імя Будзённага, імя Жукава, імя Багдана Хмяльніцкага, імя Дзяржынскага і № 550 (гл. адпаведныя артыкулы пра партызанскія брыгады і асобна дзейныя атрады).

За час дзейнасці байцы Б. п. з. падарвалі 418 вайсковых эшалонаў ворага, 1456 рэек, 193 чыг. і шашэйныя масты, знішчылі 25 танкаў і бронемашын, 190 аўтамашын, 1 самалёт, разбілі 19 варожых гарнізонаў і штабоў, 23 валасныя ўправы, 6 ням. маёнткаў, знішчылі больш за 18 тыс. і ўзялі ў палон 450 фашыстаў. Многія партызаны злучэння ўзнаг. ордэнамі і медалямі СССР, а таксама ўзнагародамі ПНР. *В. Е. Самуцін.* Мінск.

БЕЛАСТОЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ, 1) частка тэрыторыі, якая ў выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) адышла да Прусіі і паводле Тыльзіцкага дагавору 1807 перададзена Расіі. Указам цара ад 13.7.1808 атрымала назву Б. в. з цэнтрам у Беластоку і падзелена на 4 паветы: Беластоцкі, Бельскі, Сакольскі і Драгічынскі. Плошча Б. в. 7742 кв. вярсты, насельніцтва 278 937 чал. (1835). Скасавана ў 1842, паветы далучаны да *Гродзенскай губерні*, а Драгічынскі і Бельскі аб'яднаны ў Бельскі пав.

2) Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, утвораная паводле Указа Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 4.12.1939 пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР.

Паветы: Аўгустоўскі, Беластоцкі, Бельскі, Ваўкавыскі, Высока-Мазавецкі (у новых межах), Граеўскі, Гродзенскі, Ломжынскі (у новых межах) і Сакольскі; абл. ц. Беласток. Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 15.1.1940 паветы скасаваны, тэр. вобласці падзелена на 24 раёны: Аўгустоўскі, Беластоцкі, Бельскі, Бранскі Ваўкавыскі, Граеўскі, Гродзенскі, Дамброўскі, Ядвабнаўскі, Заблудаўскі, Замбраўскі, Кольнаўскі, Крынкаўскі, Ланскі, Ломжынскі, Монькаўскі (павней Кнышынскі), Парэцкі, Свіслацкі, Скідальскі, Сядоўскі, Саколкаўскі, Сапоцкінскі, Цехановецкі, Чыжаўскі. У ліст. 1940 у сувязі з перадачай Літ. ССР частак тэр. Б. в., пераважна з літоўскім насельніцтвам, скасаваны Парэцкі р-н. Вобл. пасля гэтага мела тэр. 20,9 тыс. км², нас. 1368,8 тыс. чал. (на 1.1.1941), 3 гарады абл. падпарадкавання (Беласток, Гродна, Ломжа), 10 гарадоў раённага падпарадкавання; 24 гар. пас., 2 раённыя пасёлкі, 23 раёны, 334 сельскія Саветы. 24.3.1940 адбыліся выбары ў Вярх. Саветы СССР і БССР, а 15.12.1940 — у мясц. Саветы. Створаны абласны, гарадскія, раённыя, пасялковыя выканкомы Саветаў дэп. працоўных; абласны, гарадскія (Беласток, Гродна і Ломжа) і раённыя к-ты КП(б)Б. У канцы 1939 — пач. 1940 нацыяналізаваны прамысл., акц. т-вы, аўтамаб. транспарт, кінатэатры, гандл. ўстановы, рэстараны, сталовыя. На 1.1.1941 у Б. в. было больш за 100 прамысл. прадпрыемстваў: 24 тэкстыльныя і 6 кафельна-плітачных ф-к і камбінатаў, 11 гарбарных, 4 цагельні, 2 гуты, 6 пільняў, 2 фанерныя з-ды і інш. Да канца 1940 створана 159 калгасаў (аб'яднаўвалі 6922 бядняцкія і сераднякія гасп.), 26 МТС з 262 трактарамі. У вобласці было 219,4 тыс. коней і 319,9 тыс. галоў буйн. раг. жывёлы. Рэарганізавана і значна пашырана школьная сетка, т. зв. «паўшэхныя» школы 1—3-й ступеняў ператвораны ў пачатковыя і нясповыя сярэднія; гімназіі і агульнаадук. ліцэі — у сярэднія. У 1940/41 навуч. г. працавала 1430 школ, у т. л. 48 сярэдніх (6171 настаўнік, 205 792 вучні), 3 ін-ты і 14 спец. сярэдніх навуч. устаноў. Установы культуры: 4 тэатры (у т. л. т-р муз. камедыі БССР, пераведзены ў Б. в. на стацыянарную прану), філармонія (адда. Беласт. філармоніі), 63 кінаўстаноўкі. Пастановай СНК БССР ад 25.12.1939 створаны дзярж. запаведнік *Белавежская пушча*. У час акупацыі вобл. ням.-фаш. захопнікамі насельніцтва гераічна змагалася з акупантамі. Гл. *Беластоцкае партызанскае злучэнне, Беластоцкі абласны антыфашысцкі камітэт, Беластоцкі падпольны абком КП(б)Б.*

Паводле рашэнняў Крымскай канферэнцыі кіраўнікоў урадаў — СССР, ЗША і Англіі — большая частка Б. в. адышла да Польскай Народнай Рэспублікі. Раёны Б. в., якія засталіся ў складзе БССР,— Беластавіцкі (б. Крынкаўскі), Ваўкавыскі, Гродзенскі, Сапоцкінскі, Свіслацкі і Скідальскі — у вер. 1944 уключаны ў *Гродзенскую вобласць.*

Літ.: Сборник законов Белорусской ССР и Указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР. 1938—1967, т. 1, [Мн., 1968]; Крутелевич В. А. Административно-территориальное устройство БССР, Мн., 1966; Статистический справочник состояния народного хозяйства и культуры Белорусской ССР к началу Великой Отечественной войны, М., 1943. *М. І. Каміскі.* Мінск.

БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ АНТЫФАШЫСЦКІ КАМІТЭТ, падпольная патрыятычная арганізацыя, якая дзейнічала ў Айч. вайну на акупаванай тэр. Беластоцкай вобл. Створана паводле рашэння *Беластоцкага падпольнага абкома КП(б)Б* 28.11.1943 на базе шматлікіх антыфаш. арг-цый, якія дзейнічалі на тэр. вобласці. У маі 1944 пад кіраўніцтвам к-та дзейнічала 86 антыфаш. арганізацый і груп, якія аб'ядноўвалі 639 падпольшчыкаў. У склад камітэта ўваходзілі: чл. Беластоцкага падпольнага абкома КП(б)Б Д. К. *Сукачоў* (старшыня), былы чл. КПЗБ Я. Р. Бонк, І. С. Целеш, М. М. Уладыка, Бараноўскі. Па ініцыятыве Ваўкавыскага антыфаш. к-та (кіраўнік Ладына, потым М. І. Паўлоўскі, Ф. А. Курэо) створаны баявыя антыфаш. групы і к-ты, якія асабліва актыўна дзейнічалі ў в. Сабалькі, Карпаўцы, Краснае Сяло, на Роскім цэментным з-дзе і інш. Антыфаш. арганізацыі вялі паліт. і ваенна-арганіз. работу сярод насельніцтва, мабілізоўвалі яго на актыўную барацьбу з фаш. акупантамі. Яны знішчалі фашыстаў і іх памагатых, рабілі дыверсіі на камунікацыях ворага, перадавалі партызанам здабытыя ў ворагаў зброю і боепрыпасы, медыкаменты, звесткі разведкі. З удзелам падпольшчыкаў створаны скрытыя партызанскі рэзерв у 3190 чал.

А. А. Фактаровіч. Мінск.

БЕЛАСТОЦКІ ПАДПОЛЬНЫ АБКОМ КП(б)Б у гады Вялікай Айчыннай вайны, цэнтр кіраўніцтва партыйным падполлем і партызанскім рухам на тэрыторыі Беластоцкай вобл. ў час ням.-фаш. акупацыі. Створаны паводле рашэння ЦК КП(б)Б і закінуты ў тыл ворага (Мінская вобл.) у ліп. 1943. На чале групы партыз. атрадаў з баямі зрабіў 1000-кіламетровы рэйд па тыле ворага да месца дыслакацыі. У Беластоцкай вобл. дзейнічаў з ліст. 1943 да ліп. 1944. Размяшчаўся ў Ліпічанскай пушчы (каля в. Галубы). Сакратары В. Е. *Самуцін*, Д. К. *Сукачоў*; чл. П. П. *Капуста*, С. К. *Майхровіч*, Т. М. Стрыжак. Друкаваны орган газ. «Белостокская правда» (7.11.1943—6.6.1944, перыядычнасць 8—9 разоў на месяц, усяго 60 нумароў, тыраж 500—1000 экз., рэд. Майхровіч). Падпольны абком узначальваў 3 падпольныя міжрайкомы [гл. *Міжраённыя падпольныя камітэты КП(б)Б*], падпольныя Гродзенскі гарком і 6 райкомаў [гл. *Раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б*], якія аб'ядноўвалі 41 первічную партарганізацыю, 478 камуністаў. Амаль усе райкомы выдавалі газеты. Пад кіраўніцтвам Б. п. а. КП(б)Б дзейнічаў Беластоцкі падпольны абком ЛКСМБ (чэрв. 1943 — ліп. 1944, сакратары Стрыжак, П. І. Папоў, В. А. Чыстова), які аб'ядноўваў 375 камсамольскіх арганізацый, 2626 камсамольцаў. Абком ЛКСМБ выдаваў газ. «Молодой партизан» (ліст. 1943 — ліп. 1944, перыядычнасць 4 разы на месяц, тыраж 300 экз., рэд. Я. І. Качан). Абком КП(б)Б накіроўваў дзейнасць *Беластоцкага партызанскага злучэння* і *Беластоцкага абласнога антыфашысцкага камітэта.В. Е. Самуцін.* Мінск.

БЕЛАСТОЦКІЯ СТАЧКІ 1895, 1905, 1) стачка 1895 — адна з найбольш масавых у 90-я г. 19 ст. Пачалася на тэкст. прадпрыемствах у адказ на ўвядзенне разліковых кніжак, у якіх пералічваліся абавязкі рабочых без уліку іх правоў. У ліп.— жн. стыхійныя хваляванні і забастоўкі прайшлі на ўсіх прадпрыемствах Беластока. 14 жн., у дзень увядзення разліковых кніжак, баставала больш за 10 тыс. рабочых. Яны патрабавалі павялічыць заработную плату і палепшыць умовы працы. Голад прымусіў рабочых 9 вер. спыніць забастоўку, хоць іх патрабаванняў не задаволілі. Многія яе ўдзельнікі арыштаваны. Стачка садзейнічала ўздыму рэвалюц. руху ў Расіі. 2) Стачка 1905 (12—14 кастр.) — паліт. стачка ў час *Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачкі 1905.* Пачалася на чыг. вузле і неўзабаве перакінулася на інш. прадпрыемствы горада і павета. Суправаджалася мітынгамі, дэманстрацыямі, сутычкамі з паліцыяй і войскамі. У час стачкі быў выбраны Савет рабочых дэпутатаў, але кіраўніцтва ў ім захапілі эсэры і анархісты, таму яна не перарасла ва ўзбр. паўстанне.

БЕЛАТРЫКС (*Арыёна*), зорка 2-й зорнай велічыні, з іншымі 3 яркімі зоркамі ўтварае галоўны контур сузор'я *Арыёна.*

БЕЛАХВОСТЫ ПЯСЧАНІК (Calidris temminckii), птушка атрада сеўцападобных. Даўж. каля 17 *см*, маса да 30 *г*. Апярэнне зверху пярэстае, знізу белае. Водзіцца ў тундрах Еўропы і Азіі. Гнёздаў не ўе. Яйцы (2—4) кладзе на зямлю. Корміцца дробнымі беспазваночнымі. На Беларусі рэдкі пралётны від.

БЕЛАХВОСЦІКАЎ Аляксандр Яўхімавіч (падпольная мянушка Альдэмар; 10.8.1914, в. Ляхавік Аршанскага пав. Магілёўскай губ.— 5.5.1943), удзельнік *Віцебскага камуністычнага падполля*, кіраўнік разведвальна-дыверсійнай групы ў Вялікую Айчынную вайну. З сялян. Кандыдат у чл. КПСС. Скончыў Бел. ін-т нар. гасп. ў 1938, напярэдадні вайны працаваў нач. сектара Віцебскай абл. планавай камісіі, пазаштатным сакратаром Кастрычніцкага райкома ЛКСМБ Віцебска. Пакінуты ў горадзе для падпольнай работы. З Л. І. Хрыпачом і сястрой Марыяй у ліп. 1941 стварыў шырока разгалінаваную падпольную групу, якая амаль 2 гады вяла разведвальна-дыверсійную і агітац.-прапаганд. дзейнасць, збірала партызанам зброю і медыкаменты, наводзіла сав. самалёты на вароджыя аб'екты; асабліва вялікія страты мелі акупанты ў ноч на 22.2.1942 паблізу Смаленскага рынку. У маі 1943 Б. і многія чл. групы схоплены фашыстамі і расстраляны. Узнаг. пасмяротна ордэнам Айч. вайны 1-й ступені. Яго імем названа вуліца ў Віцебску. *Н. І. Дарафеенка.* Віцебск.

БЕЛАЦАРКОЎСКІ ДАГАВОР 1651, падпісаны 18 вер. пад Белай Царквой гетманам Украіны Б. Хмяльніцкім і камісарам польскага ўрада каронным гетманам М. Патоцкім. Пайсці на мір Хмяльніцкага прымусілі паражэнне пад Берастэчкам, ваен. няўдачы на Чарнігаўшчыне, занятае Кіева войскамі Я. Радзівіла, якія ўварваліся на Украіну пасля разгрому на Беларусі паўстанняў у раёнах Гомеля, Чачэрска, Прапойска і інш. Паводле Б. д. колькасць рэестравых казакоў зменшвалася з 40 да 20 тыс. чал.; ім даставалася жыць толькі ў Кіеўскім ваяводстве, адзіным, якое асталося пад уладай Хмяльніцкага; польскай шляхце вярталіся былыя маёнткі і прыгонныя. Абмяжоўваліся паліт. правы ўкр. гетмана: ён падпарадкоўваўся каронаму гетману, пазбаўляўся права зносін з інш. дзяржавамі і саюзу з крымскім ханам. Пасля смерці Хмяльніцкага права на-

значаць і змяшчаць гетмана перадавалася каралю. Укр. народ, незадаволены ўмовамі Б. д., узмацніў нац.-вызв. барацьбу. Пасля перамогі Хмяльніцкага над польскімі войскамі пад Батогам на Брацлаўшчыне 23.5(2.6) 1652 Б. д. ануляваны.

Літ.: Освободительная война 1648—1654 гг. и воссоединение Украины с Россией, Киев, 1954.

БЕЛАШОВА (Белашова-Аляксеева) Кацярына Фёдараўна [н. 19.11(2.12). 1906, Пецярбург], рускі савецкі скульптар. Чл.-кар. Акадэміі мастацтваў СССР (1964). Нар. мастак СССР (1963). Чл. КПСС з 1945. Скульпт. партрэты Б. вызначаюцца псіхалагічнай выразнасцю і прастатой формы («Мужчынскі партрэт», 1934; «Партрэт К. А. Трапёва», 1950, і інш.). У жаночых і дзіцячых вобразах найбольш поўна раскрываецца лірычная тэма («Шурка», 1949; «Летуценне», 1957, і інш.). Гераізм сав. народа адлюстраваны ў многіх работах ваен. і пасляваен. часу («Няскораная», 1943; «Партызан», 1944; «Зоя», 1948, і інш.). Асобнае месца ў творчасці Б. займае вобраз А. Пушкіна (помнік паэту ў Пушкінскіх Гарах, 1959, і інш.). Дзярж. прэмія СССР 1967. Узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: Бескин О. М. Екатерина Федоровна Белашова, М., 1958; Екатерина Федоровна Белашова. [Альбом репродукций], М., 1966.

БЕЛАЯ, рака, левы прыток Камы. Цячэ пераважна па тэр. Башк. АССР. Даўж. 1430 *км*, пл. бас. 142 тыс. *км*². Пачынаецца ў гарах Паўд. Урала, на У ад г. Ірэмель. Пасля зліцця з р. Уфой даліна вельмі расшыраецца, рака становіцца раўніннай. Жыўленне пераважна снегавое. Ледастаў з сярэдзіны лістапада да сярэдзіны красавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 1000 *м*³/*сек*. Суднаходная ад вусця да Уфы. На рацэ г. Беларэцк, Салават, Ішымбай, Стэрлітамак, Уфа.

БЕЛАЯ, вёска ў Слабадскім с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Жданава. За 28 *км* на З ад Мазыра, 162 *км* ад Гомеля, 25 *км* ад чыг. ст. Козенкі. 376 ж., дварoў 125 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі.

БЕЛАЯ ВЕЖА, адна з назваў старарускага помніка абарончага дойлідства 13 ст. ў Камянцы Брэсцкай вобл. Гл. *Камянецкая вежа.*

БЕЛАЯ ГАРА (Bílá Hora), узвышша каля Прагі, дзе 8.11.1620 адбылася бітва войск чэшскіх паўстанцаў з войскамі кааліцыі аўстрыйскіх і іспанскіх *Габсбургаў*, Баварыі, інш. каталіцкіх княстваў і папскай курыі. Паўстанцы былі разбіты. Чэхія на 300 гадоў страціла нац. незалежнасць і стала адным са спадчынных уладанняў імперыі Габсбургаў, якая ажыццяўляла палітыку грабяжу і анямечвання мясцовага насельніцтва.

Літ.: История Чехословакии, т. 1, М., 1956.

БЕЛАЯ ДУБРОВА, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Беседзь. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дуброва». За 12 *км* на ПдЗ ад Касцюковіч, 116 *км* ад Магілёва, 16 *км* ад чыг. ст. Камунары. 788 ж., дварoў 275 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, майстэрня для рамонту с.-г. тэхнікі, магазін, швейная майстэрня. На брацкай магіле помнік 13 сав. воінам, якія загінулі пры вызваленні вёскі ў 1943.

БЕЛАЯ КУРАПАТКА (Lagopus lagopus), птушка атрады курыных. Даўж. каля 40 *см*, маса 450—650 *г*. Зімой апярэнне белае, летам, вясною і ўвосень — жаўтавата-бураватае і каштанавырыжае; ногі і ноздры густа апераныя. Жыве найб. у тундрах Еўропы, Азіі, Амерыкі; на зіму пералятае ў лесатундру і далей на Пд. На Беларусі (у паўн. частцы) водзіцца на вярховых балотах, асабліва на ўчастках з нізкарослай хвояй і бярэзнікам. Зімою трымаюцца вялікімі чародамі, увесну разбіваюцца на пары. Гняздуецца Б. к. на зямлі, нясе 5—20 яец. Корміцца пупышкамі дрэў, лісцем, ягадамі. На Пн — важны аб'ект промыслу, на Беларусі паляванне забаронена.



БЕЛАЯ ЛІПА, вёска ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., на р. Бярозка (прыток Зах. Дзвіны). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Суворава. За 12 *км* на Пн ад г. Сянно, 67 *км* ад Віцебска, 30 *км* ад чыг. ст. Бурбін. 140 ж., гасп. 45 (1970). Клуб., б-ка, мед. пункт.

БЕЛАЯ ЛУЖА, вёска ў Гацукоўскім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 37 *км* на Пн ад Слуцка, 65 *км* ад Мінска, на шашы Мінск — Слуцк. 314 ж., дварoў 91 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

БЕЛАЯ РУСЬ, назва зямель Паўн.-Усх. Русі ў 12—15 ст. і Беларусі з 14 ст. Паходжанне тэрміна канчаткова не высветлена. Адны лічылі, што ён абазначаў землі, якія не залежалі ні ад татара-манголаў, ні ад літ. феадалаў. Другія — што назва паходзіць ад колеру адзення жыхароў гэтых зямель або ад іх фізічнай адзнакі — больш светлыя, бялявыя. Трэція — што Б. Р. называлі землі, насельніцтва якіх было хрысціянскае, у процівагу Чорнай Русі, дзе пэўны час пераважалі язычнікі. Магчыма, напачатку тэрмінам Б. Р. падкрэслівалася незалежнасць, веліч. Паводле В. М. Таціщава, тэрмін Б. Р. упершыню ўпамінаецца ў Раскольніцкім і Растоўскім рукапісах пад 1135 пры назве Растова-Суздальскага княства. Больш часта яго ўжывалі ў 2-й пал. 12 ст. Князем Б. Р. з 1157 называўся *Андрэй Багалюбскі*. Маскоўска-Суздальскую Русь наз. Б. Р. і пасля ўтварэння рус. цэнтраліз. дзяржавы. У 15 ст. тэрмін Б. Р. набыў значэнне Вялікая Русь. Іван III увёў Б. Р. у тытул вял. кн. маскоўскага. Тэрмін Б. Р. у дачыненні да зямель Беларусі ўпершыню ўжыты ў 14 ст. канцлерам Польшчы Янам Чарнкоўскім у «Хроніцы Польшчы» (на лац. мове), дзе Полацк названы «крэпасцю Белай Русі» («castrum Albae Russiae»). У 16—17 ст. асобныя замежныя аўтары ў паняцце Б. Р. ўключалі ўкраінскія і ўсходнебеларускія землі. У 1-м выд. «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі (1578)» А. Гваньіні

над Б. Р. разумеў Русь Маскоўскую, у 2-м жа, дапоўненым выданні (1611), сцвярджаў: «А ёсць траякая Русь: адна Белая, другая Чорная, трэцяя Чырвоная. Белая каля Кіева, Мазыра, Мсціслаўля, Віцебска, Оршы, Полацка, Смаленска і Зямлі Северскай, якая здаўна належыць Вялікаму княству Літоўскаму». Папскі нунцый у Польшчы Торэс паведамляў у 1622 Рыму, што Белая Русь «цягнецца ад Рыгі, сталіцы Ліфлянды, да Маскоўскае мяжы і ўключае Полацк, Оршу, Віцебск, Магілёў». Тэрмін Б. Р. ужываюць Густынскі летапіс (канец 16 — пач. 17 ст.), польскі гісторык і географ Сымон Старавольскі (1632) і інш. Урад Рускай дзяржавы пад Белай Руссю разумеў Полацкую, Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую вобл., а Гродна, Мінск, Нясвіж, Пінск, Тураў, Брэст называў літоўскімі. Заняўшы частку ўсходнебеларускіх зямель, цар Аляксей Міхайлавіч свой тытул гасудар і самадзержац «всея Вялікая і Малыя Расіі» 3.3.1655 замяніў на «всея Вялікая і Малыя і Белыя Расіі» (існаваў да 1721, калі было ўведзена найменне «імператар усерасійскі»). З 1-й пал. 17 ст. гістар. дакументы ў адносінах да ўсх. ч. этнаграфічнай Беларусі (Полацкай, Віцебскай і Магілёўскай зямель) ужываюць тэрміны *Беларусь*, беларускі.

Літ.: Татищев В. Н. История Российская, т. 1, М.—Л., 1962, с. 355—356; Державин Н. С. Происхождение русского народа. Великорусского, украинского, белорусского, М., 1944; Крапівін П. Ф. Паходжанне назваў «Русь», «Белая Русь», «Чорная Русь» і «Чырвоная Русь», «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1956, № 3, с. 53—67; Соловьев А. В. Великая, Малая и Белая Русь, «Вопросы истории», 1947, № 7; Юхо Я. Пра назву «Беларусь», «Полымя», 1968, № 1; Ламанский В. Белая Русь, «Живая старина», 1891, в. 3; Потебня А. Этимологические заметки (Белая Русь), «Живая старина», 1891, в. 3; Соловьев А. Белая и Черная Русь, Белград, 1940, с. 29—66. *І. А. Юхо.* Мінск.

«БЕЛАЯ РУСЬ», штодзённая грамадска-палітычная і літаратурная газета рэакцыйнага кірунку, якая выдавалася ў Вільні на рус. мове з 19.2 да 20.6.1906. Орган чарнасоценнага саюза «Паўночна-Заходняе рускае вечa». Была разлічана на рус. насельніцтва Паўн.-Зах. краю. Выйшла 93 нумары. Падтрымлівала царскі маніфест ад 17.10.1905, займала адкрыта контррэвалюц. пазіцыю. Газеце была прызначана ўрадавая субсідыя.

БЕЛАЯ САВА (Nyctea scandiaca), птушка сямейства сапраўдных соў. Даўж. да 70 *см*, размах крылаў 145—160 *см*, маса да 2,5 *кг*. Апярэнне ў дарослых белае, у першагодкаў — з бурымі папярочнымі плямкамі. Пальцы ўкрыты пер'ем. Радзімая яркa-жоўтая. Б. с. водзіцца ў тундрах Еўропы, Азіі, Паўн. Амерыкі і на а-вах Паўн. Ледавітага ак. Зімою часам залятае на Беларусь. Гняздо робіць на зямлі ў выглядзе простай ямкі. Нясе 3—11 круглых яец. Корміцца мышападобнымі грызунамі і птушкамі; ловіць зайцоў.

БЕЛАЯ СІТАЎКА (Motacilla alba), птушка атрада верабіных. Маса 20—25 *г*. Цела прадаўгаватае, хвост доўгі. Апярэнне шэрае з чорнымі і белымі плямкамі. Асабліваcць паводзін — плаўнае пагойдванне хваста. Пашырана ў Еўропе, Азіі, Афрыцы і часткова ў Паўн. Амерыцы. На Беларусі водзіцца ўсюды, нар. назва пліска. Прылятае парамі 9—14 сак. Гняздуецца каля вады (у берагах, пад мастамі, у шчылінах плацін і інш.). Нясе 4—5, часам 6 яец, наседжвае 11—12 дзён. За лета выгадоўвае 2 патомствы. Знішчае шкодных насякомых.



БЕЛАЯНІС (Beloyannis) Нікас (12.12.1915, в. Амаліяс на Пелапанесе — 30.3.1952), дзеяч грэч. рабочага руху, нац. герой Грэцыі. З сям'і селяніна. Першы раз арыштаваны, калі быў гімназістам, за ўдзел у забастоўцы вінаградараў (1932). З 1934 чл. кампартыі. У 1936, 1938, 1941—43 вязень турмаў і канцлагераў. У вер. 1943 уцёк да партызанаў, стаў паліт. камісарам адной з дывізій Нар.-вызв. арміі Грэцыі (1943—44). Быў камісарам у Дэмакр. арміі ў грамадз. вайну 1946—49. З 1950 чл. ЦК кампартыі Грэцыі. У канцы 1950 арыштаваны і пасля двух судовых працэсаў расстраляны.



Літ.: Витин М. Г. Белоянис, М., 1964 (Жизнь замечательных людей).

БЕЛГАРАД, горад, цэнтр Белгародскай вобл. РСФСР, на р. Северскі Данец. Чыг. вузел. 151 тыс. ж. (1970).

У летапісах упершыню ўпамінаецца пад 1237. У 1598—1785 горад-крэпасць, цэнтр Белгародскай абарончай лініі супраць крымскіх татар на паўд. межах Расіі. Сав. ўлада ўстаноўлена 30.10(12.11). 1917. У Вял. Айч. вайну ў раёне Б. адбываліся цяжкія баі (гл. *Курская бітва 1943*). Вызвалены Сав. Арміяй 5.8.1943.

Цэнтр прамысловасці буд. м. (цэментны з-д, камбінат азбестацэментавых вырабаў, 2 камбінаты буд. м., 2 з-ды жалезабетонных вырабаў, кар'еры здабычы мелу). Маш.-буд. прамысл. (катлабудаўнічы, электра- і рамонтны механічны з-ды). Мясаптушкакамбінат, малочны, кансервавы і вітамінны камбінаты, швейная ф-ка. Пед. ін-т, філіялы Усесаюзных завочных політэхнічнага і фін.-эканам. ін-таў, 6 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

БЕЛГАРОДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 6.1.1954. Пл. 27,1 тыс. *км*². Нас. 1261 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 18 раёнаў; 9 гарадоў, 11 гар. пас. Цэнтр г. Белгарад.

Б. в. размешчана ў паўд.-зах. частцы Сярэднерускага ўзвышша (выш. да 276 *м*). Рэльеф вельмі парэзаны ярамі і лагчынамі. Карысныя выкапні: жал. руда (⅓ запасаў Курскай магн. анамаліі), мергель, гліна, мел, баксіты, торф. Клімат умераны кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —8°, ліп,


БЕЛГАРОДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Масштаб 1:3 000 000
км 30 0 30 60 км
38° у. д.
Шыгры
Касторное
Шын
Баседнна
Мантурава
Сасноука
Стары Аскол
Белгародская вобл.
Губкін
Сталіцкае
Абаянь
Скародное
Васкрасенаўка
Крутое
Прасвярэўка
Карочка
Прыгарны
Валатавае
Красное
Белянікіна
Каротае
Астыгожск
Новы Аскол
Афанасьеўка
Краснагвардзейскае
Старыя Хутары
Старыя Аскол
Старавяскоўка
Каменка
Валуйкі
Шыпаўка
Прыволле
Сеўрюкава
Нікітаўка
Бабчанскае
Бабчанскі
Бабчанскі Хутар
Бельгатроіцкае
Бельгатроіцкі Хутар
Бельгатроіцкі Выселак
Бельгатроіцкая
Бельгатроіцкі Выселак
Бельгатроіцкая
Бельгатроіцкі Выселак
Бельгатроіцкая



некалькі а-воў на Пд Атлантычнага ак. 28.1. 1820 адкрыў Антарктыду. 2, 5 і 6 люг. зноў наблізіўся да яе ледзянога ўзбярэжжа. У 1821 экспедыцыя адкрыла в-аў Пятра I і Зямлю Аляксандра I. Вяліся рознабаковыя акіянаграфічныя назіранні. Пазней Б. займаў адказныя пасады ў ваен. флоце Расіі, садзейнічаў умацаванню Балтыйскага флоту. Імем Б. названы мора каля берагоў Антарктыды і некалькі а-воў.

Тв.: Двукратные изыскания в Южном Ледовитом океане и плавание вокруг света в продолжение 1819, 20 и 21 гг., совершенные на шлюпах «Восток» и «Мирный»..., 3 изд., М., 1960.

БЕЛІЦА (Лукаўскі канал), левы прыток р. Дабасны (бас. Дняпра). Даўж. 31 км. Цячэ па плоскай, злёгку ўгорыстай раўніне, у Рагачоўскім і Жлобінскім р-нах Гомельскай вобл. Рэчышча каналізавана і фактычна з'яўляецца асушальным каналам. Пл. вадазбору 197 км². Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,9 м³/сек.

БЕЛІЦА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Нёман. Цэнтр сельсавета і калгаса «Беліца». За 30 км на Пд ад Ліды, 120 км ад Гродна, 9 км ад чыг. ст. Нёман, на шашы Слонім — Ліда. Аўтобусная ст. 913 ж., двароў 285 (1970). Малочны з-д, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 4 магазіны. Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЕЛІЦК, рабочы пасёлак (з 1960) у Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. За 33 км на ПдУ ад Рагачова, 80 км ад Гомеля, 17 км ад чыг. ст. Салтанаўка (на лініі Бабруйск — Гомель), з якою Б. злучаны вузкакалейкай. 1,2 тыс. ж. (1970). Торфапрадпрыемства «Беліцкае», паўбрыкетны з-д, мех. майстэрні для рамонту торфаздабываючай тэхнікі, электрацэх, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, дзіцячы сад і яслі, б-ка, клуб, бальніца. На брацкай магіле помнік 12 сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЕЛІЧ (Белић) Аляксандр [2(14).8.1876, Бялград — 26.2.1960), сербскі моваznавец. З 1937 прэзідэнт Сербскай АН. Чл. Пецярбургскай АН (1910). Вывучаў дыялекталогію, акцэнталогію і гісторыю паўд.-слав. моў. Аўтар прац: «Дыялекты Усходняй і Паўднёвай Сербіі» (1905), «Акцэнталагічныя даследаванні» (1914), «Пра парны лік у славянскіх мовах» (1932), «Сучасная сербскахарвацкая мова» (т. 1—2, 1948—49). Лінгвіст. погляды Б. ў кнізе «Аб прыродзе і развіцці мовы» (т. 1—2, 1941—59). Рэдагаваў навук. час. «Južnoslovenski filolog» («Паўднёваслав. філолаг»).

БЕЛІЧОНАК Іван Мікалаевіч (н. 2.2.1934, в. Асмолаўка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1965). Чл. КПСС з 1953. Працуе з 1951: прыёмшчык, камбайнер-механік Любанскай МТС. З 1958 механізатар, з 1970 брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Чырвоная змена» Любанскага р-на Мінскай вобл.

БЕЛІЧЫ, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Белічы». За 12 км на ПдЗ ад Слуцка, 118 км ад Мінска, каля шашы Слуцк — Салігорск (2,5 км). 543 ж., гасп. 178 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін.

БЕЛКААПСАЮЗ, гл. *Спажывецкая кааперацыя*.

БЕЛМІЖКАЛГАСБУД, Беларускае рэспубліканскае аб'яднанне міжкалгасных будаўнічых арганізацый. Створана ў 1969 на базе Галоўкалгасбуда Мін-ва сельскага буд-ва БССР. Выконвае функцыі ген. падрадчыка па буд-ве ў калгасах рэсп. Асн. задача — развіццё індустр. метадаў буд-ва ў калгасах. У склад Б. ўваходзяць: гал. ўпраўленне мат.-тэхн. забесп. і яго база, праектна-даследчы ін-т Белкалгаспраект з філіяламі ў кожнай вобласці, база вытв. навучання, 2 вучэбна-курсавыя камбінаты (у Гомелі, Гродне), 6 абласміжкалгасбудаў з падпараджанымі ім міжкалгаснымі будаўнічымі арганізацыямі і прадпрыемствамі па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў [15 з-даў і палігонаў жалезабетонных вырабаў, з-д сілікатных вырабаў у Смалявічах, з-д буд. дэталяў у Барысаве, перасоўная механізаваная калона (ПМК), спецыялізаваная ПМК].

БЕЛОІД, лякарства. Мае алкалоіды беладонны, эргатаксін і бутылэтылбарбітуравую к-ту. Спазмалітычны і процірвотны сродак. Ужываецца ўнутр пры функцыянальных хваробах вегетатыўнай нервовай сістэмы, алергіях, хваробе Меньера. Проціпаказаны пры парушэннях мазгавога кровазвароту.

«БЕЛОРУССКАЯ ДЕРЕВНЯ», назва дадатка да газ. «Звезда», які выдаваўся ў Мінску з лютага 1921. З сакавіка 1924 — самастойная газ. *«Беларуская вёска»*.

«БЕЛОРУССКАЯ КРИНІЦА», экапамічна-гаспадарчы часопіс, які выдаваўся ў Петраградзе Беларускім аддзелам Камісарыята па справах Нацыянальнасцей Саюза Камун Паўночнай вобл. Выходзіў на рус. мове: у ліст. 1918 № 1—2, у студз. 1919 № 1—2. Быў разлічаны на парт., сав. і гасп. работнікаў. Друкаваў распараджэнні Сав. ўрада, хроніку эканам. жыцця Сав. Расіі і Беларусі. Былі змешчаны праблемныя арт.: «Як мы павінны будавацца», «Да пытання пра пашырэнне на Беларусі сельскагаспадарчай адукацыі», «Беларускі настаўнік і школа» і інш. Рэд. І. Баранкевіч. *М. А. Тарасаў.* Ленінград.

«БЕЛОРУССКАЯ ПРАВДА», падпольная газета, орган партызанаў-камуністаў Беларусі; выдавалася ў 1920 на рус. мове і распаўсюджвалася ў раёнах БССР, акупаваных бурж. Польшчай. Вядома 4 нумары: ад 17.5, 31.5, 7.6 і 17.6.1920. Заклікала рабочых і сялян ствараць партыз. атрады, выкрывала

хлусню акупантаў, іх зверствы і здзекі з мірнага насельніцтва. Апублікавала зварот «Да працаўнікоў Беларусі», «Дзесяць запаведзей чырвоных партызанаў», арт. «Як перамагчы», «Дружна на барацьбу, і мы пераможам!», «Час расплаты настаў» і інш. матэрыялы.

М. С. Зярніцкі. Мінск.

«БЕЛОРУССКІЙ АРХІВ ДРЭВНІХ ГРАМОТ» («Беларускі архіў старажытных грамат»), першы зборнік дакументаў па гісторыі беларускіх зямель. Надрукаваны ў Маскве ў 1824 І. І. *Грыгаровічам* і быў як бы працягам агульнарускага «Збору дзяржаўных грамат і дагавораў», выдадзенага Камісіяй друкавання дзярж. грамат і дагавораў пры Маскоўскім архіве Мін-ва замежных спраў. Змешчаныя ў зборніку 57 дакументаў асвятляюць гісторыю Усх. Беларусі 16—18 ст., сведчаць пра адзінства бел. зямель з Расіяй, іх паліт. сувязі [дарчая грамата Аляксея Міхайлавіча жыхарам Магілёва з нагоды далучэння да Расіі (1654); грамата польскага караля Яна Казіміра 1661, з якой відаць, што ў час *вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54* магілёўчане былі на баку Расіі; граматы каралевіча Уладзіслава (1618) і цара Пятра I (1709) на дазвол магілёўскім купцам свабоднага праезду для гандлю ў Расіі і на Украіне]. Многія дакументы адлюстроўваюць дзейнасць князёў і феадалаў па падтрымцы і ўмацаванні праваслаўнай царквы на Беларусі. У зборніку ёсць звесткі пра развіццё бел. гарадоў, гандлю; пра самакіраванне, фарміраванне гарадскога саслоўя, дзейнасць купецкіх кас, царкоўных брацтваў, у т. л. дазвол епіскапу Георгію Каніскаму на адкрыццё ў Магілёве грэка-лацінскага вучылішча і друкарні (1768) і інш. *П. Р. Казлоўскі.* Мінск.

«БЕЛОРУССКІЙ ВЕСТНИК», штодзённая грамадска-палітычная і літаратурная ілюстраваная газета чарнасоценнага шавіністычнага кірунку, якая выдавалася ў Мінску з 21.11. 1904 да 16.11.1905 на рус. мове. Выйшаў 331 нумар. Актыўна падтрымлівала палітыку царызму. Вяла барацьбу з прагрэс. газ. *«Северо-Западный край»*.

«БЕЛОРУССКІЙ ВЕСТНИК», штотыднёвая грамадская і літаратурная газета вернападданіцкага рэакцыйнага кірунку, якая выдавалася ў Вільні з 17.6.1912 да 12.1.1913 на рус. мове. Выйшла 28 нумароў. Орган т. зв. «Беларускага таварыства» («Белорусское об-во»), дзейнасць якога мела шавіністычны характар.

«БЕЛОРУССКІЙ УЧИТЕЛЬ», культурна-асветны часопіс, заснаваны на сродкі настаўніцкага гуртка Віцебскай губ. Выйшаў адзін выпуск у лютым 1909 ў Пецярбурзе на рус. мове, у якім змешчаны артыкулы на педагагічныя тэмы («На якой мове вучыць у школах Беларусі», «У настаўніцкіх таварыствах Беларусі», «Мастацтва ў пачатковай школе», «Пра пакаранні і ўзнагароды ў сувязі з дысцыплінай у сучаснай народнай школе»), інфармацыя аб дзейнасці беларускага выдавецтва ў Пецярбурзе *«Загляне сонца і ў наша аконца»*, агляд дзейнасці бел. культурна-асветных арганізацый і інш. матэрыялы. Час. выступіў за ўвядзенне бел. мовы ў школах Беларусі, асуджаў шавіністычную праграму т. зв. «Беларускага таварыства».

«БЕЛОРУССКІЙ УЧИТЕЛЬСКІЙ ВЕСТНИК», штомесячны мясцовы часопіс для настаўнікаў і работнікаў народнай асветы, які выдаваўся ў Магілёве ў 1910—11 на рус. мове. Фактычна быў органам Таварыства ўзаемадапамогі настаўнікам нар. вучылішчаў Магілёўскай губ. У 1910 выйшлі № 1—5 (№ 2—3 здвоены), у 1911 — № 6 з дадаткам статута і і інш. афіц. матэрыялаў т-ва. Друкаваў матэрыялы па педагогіцы і нар. асвеце, пра становішча настаўнікаў. Ад ацэнкі грамадска-паліт. пытанняў ухіляўся.

БЕЛПРАМПРАЕКТ, Беларускі дзяржаўны інстытут прамысловага праектавання Дзяржбуда БССР. Арганізаваны ў 1949. Ажыццяўляе праектаванне прамысл. комплексаў і асобных з-даў, ф-к, цэхаў (уключаючы ген. планы) з поўным рашэннем агульнабудаўнічых пытанняў, часткавай распрацоўкай тэхнал. працэсаў (прадпрыемствы буд. матэрыялаў і інш.). Выконвае функцыі тэр. праектнага ін-та па прамысл. праектаванні. У складзе Б. 2 архітэктурна-буд. аддзелы, аддзелы ген. плана, прамысл. вузлоў, ацяплення і вентыляцыі, сан.-тэхнічны, тэхналагічны, электрааддзел, аддзел механізацыі інж.-тэхн. разлікаў.

БЕЛСЕЛЬГАСТЭХНІКА, рэспубліканскае аб'яднанне Савета Міністраў БССР. Уваходзіць у склад Саюзсельгастэхнікі. Створана 13.3.1961. Дзейнічае на гасп. разліку на аснове планаў і заданняў, якія зацвярджаюцца Саветам Міністраў БССР і Саюзсельгастэхнікай. Гал. функцыі: развіццё комплекснай механізацыі і электрыфікацыі с.-г. вытворчасці, укараненне ў вытворчасць новай тэхнікі, прагрэс. тэхналогіі, сродкаў аховы раслін, дасягненняў навукі і перадавога вопыту; мат.-тэхн. забеспячэнне; арганізацыя высокапрадукцыйнага выкарыстання, тэхн. абслугоўвання, рамонту і захоўвання машын і інш. Для выканання гэтых функцый Б. мае абл. аб'яднанні, трэст рамонтных прадпрыемстваў, трэсты Прамбурвод, рамонтна-будаўнічыя, механізаваных работ і хім. аховы раслін, а таксама гандл. базы, праектна-тэхнал. ін-т Сельгастэхпраект, лабараторыі кантролю якасці прадукцыі, якая пастаўляецца с. гасп.

129 гандл. баз Б. забяспечваюць с. гасп. рэспублікі трактарамі, камбайнамі, грузавымі і спец. аўтамабілямі, мінер. ўгнаеннямі, запаснымі часткамі і інш. мат.-тэхн. сродкамі — усяго больш як 70 тыс. назваў. Для рамонту с.-г. тэхнікі створана сетка спецыялізаваных з-даў (рамонт трактароў) і майстэрняў (рамонт камбайнаў, бульбакапалак, прычэпаў, ільнамалатарняў і інш. машын). Тэхн. абслугоўванне аўтамабіляў калгасаў і саўгасаў ажыццяўляюць станцыі тэхн. абслугоўвання. Аб'яднанні, спецыялізаваныя аддзяленні, атрады і аўтагаспадаркі Б. па дагаворах з калгасамі і саўгасамі нарыхтоўваюць і вывозяць торф, вапнуюць кіслыя глебы, будуюць і рамантуюць дарогі і інш. Механізацыю жывёлагадоўчых ферм ажыццяўляюць лінейныя буд.-мантажныя ўчасткі і перасоўныя механізаваныя калоны. Артэзіянскія калодзежы і воданапорныя вежы будуе трэст Прамбурвод (гл. табл.).

Асноўныя паказчыкі работы Белсельгастэхнікі

Віды дзейнасці	1961	1965	1969
Пастаўлена сельскай гаспадарцы, штук:			
трактароў	5717	9015	14 500
камбайнаў збожжаўборачных	965	2950	4000
аўтамабіляў грузавых	2665	2329	5000
Мінеральных угнаенняў, млн. *т* ва ўмоўных туках	0,97	1,96	3,09
Агульны кошт выкананых работ, млн. руб.	56,1	114,7	224,8
У тым ліку:			
работы рамонтных заводаў і майстэрняў	27,9	52,3	99,1
механізацыя і электрыфікацыя сельскагаспадарчай вытворчасці і буд-ва свідравін	6,6	13,7	31,8
механізаваныя работы	9,8	17,8	41,2
перавозкі аўтатранспартам	11,1	24,7	42,0

Арганізацыйна Б. складаецца з 6 абл. аб'яднанняў, якім падпарадкаваны 6 абл. трэстаў механізаваных работ і хім. аховы раслін і 235 раённых аб'яднанняў і аддзяленняў. Кожнае раённае аб'яднанне мае рамонтную майстэрню, лінейны буд.-мантажны ўчастак, аўтагаспадарку, гандл. базу і інш. службы. Старшыня рэспубліканскага аб'яднання Л. І. Хітрун.

Літ.: Специализация ремонтной сети (Опыт объединения «Белсельхозтехника»), М., 1964; Толстов В. В. и Корсак М. Д. Комплексное обслуживание техники в колхозах, Мн., 1967; Бабіцкі У. Г. і Канечны М. Л. Тэхнічнае абслугоўванне аўтамабіляў калгасаў і саўгасаў, Мн., 1969; Галай С. П. и Макогонюк А. Г. Комплексная механизация животноводческих ферм, Мн., 1968. *Л. І. Хітрун.* Мінск.

БЕЛТА, гл. *Тэлеграфнае агенцтва Беларускай ССР.*

БЕЛТРАНСБУД, беларускі трэст транспартнага буд-ва Галоўнага ўпраўлення чыг. буд-ва Цэнтра і Захаду Мін-ва транспартнага буд-ва СССР. Створаны ў 1955. Аб'ядноўвае 6 буд.-мантажных упраўленняў (у Мінску 2, Брэсце, Гомелі, Віцебску, Оршы), мае з-д жалезабетонных канструкцый (Орша). Асн. задача: буд-ва чыг. ліній, прадпр., будынкаў і інш. аб'ектаў чыгункі на тэр. БССР.

БЕЛУ-АРЫЗОНТЫ (Belo Horizonte), горад на ПдУ Бразіліі, адм. ц. штата Мінас-Жэрайс. Вузел чыг. і шашэйных дарог. 1152 тыс. ж. (1968). Цэнтр горназдабываючай прамысловасці (жалезная, марганцавая руды, алюмініевая сыравіна, золата, алмазы). Металургічная, маш.-буд. (у т. л. трактарная), металаапр., нафтаперапр., цэментная, харч., тэкст. прамысловасць. Апрацоўка алмазаў. Ун-т (з 1927).

БЕЛУШ Міхаіл Андрэевіч (1925, в. Ліпічанская Руда Шчучынскага пав. Навагрудскага ваяводства — 16.6.1944), партызан, герой Вял. Айч. вайны. З сялян. З мая 1943 партызан атрада «Кастрычнік» партыз. брыгады Першамайскай Баранавіцкай вобл. Узарваў 8 варожых эшалонаў. У баі пры разгроме варожага гарнізона ў в. Купіск накрыў сваім целам станковы кулямёт. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені. На месцы гераічнага ўчынку Б. помнік-абеліск. Яго імем названа вул. ў Гродне.



БЕЛФАСТ (Belfast), горад, з 1920 адм. ц. Паўн. Ірландыі (Вялікабрытанія). На р. Лаган пры ўпадзенні ў заліў Белфаст-Лох. Вял. порт, чыг. вузел. Аэрапорт. 550 тыс. ж. (1966). Вытворчасць ільняных, шарсцяных і сінт. тканін, судна-, самалёта- і машынабудаванне; хім., мэблевая і харч. прамысловасць, канатныя з-ды. Ун-т (з 1845). Музей, маст. галерэя.

БЕЛЫ Андрэй Анісімавіч (н. 17.6.1922, в. Навінкі Рэчыцкага пав. Гомельскай губ.), Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1949. Напярэдадні вайны настаўнічаў. У Чырв. Арміі з 1941; скончыў Сталінградскае вуч. сувязі. На фронце з 1942. Удзельнік баёў на Паўд.-Зах., Данскім, Сталінградскім, Цэнтр. франтах. Вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. Байцы ўзвода сувязі, якім камандаваў Б., пад агнём ворага на плытах пераправіліся на правы бераг, выбілі праціўніка з траншэй, наладзілі сувязь камандзіра батальёна з камандзірамі рот, гэтым памаглі выканаць баявую задачу. Служыць у Сав. Арміі.



БЕЛЫ Віктар Аронавіч [н. 1(14).1.1904, Бярдзічаў], рускі савецкі кампазітар і музычны дзеяч. Засл. арт. БССР (1955), засл. дз. маст. РСФСР (1956). Чл. КПСС з 1939. Скончыў Маск. кансерваторыю (1929), дзе выкладаў у 1925—48 (праф. з 1941). У 1949—52 праф. Бел. кансерваторыі. З 1957 рэд. час. «Музыкальная жизнь» (Масква). Аўтар вядомых песень «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», «Арляня», «У абарону міру» і «Балада пра Аляксандра Матросава» (Дзяржпрэмія СССР 1952), «Балада пра капітана Гастэлу»; фп. п'ес, у т. л. «Беларускіх напеваў», «Беларускай калыханкі і жартоўнай»; вакальна-сімф. паэмы «Галодны паход», вак. цыкла «Свяціць заўсёды» на словы У. Маякоўскага і інш. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

БЕЛЫ Уладзімір Аляксеевіч (н. 8. 6. 1922, Краснадар), беларускі савецкі вучоны ў галіне механікі палімераў. Чл.-кар. АН БССР (1969). Чл. КПСС з 1947. Засл. вынаходнік БССР (1967). Скончыў Транспартны ін-т (Растоў-на-Доне, 1945). У 1963—69 заг. Аддзела механікі палімераў АН БССР. З 1969 рэктар Гомельскага дзярж. ун-та. Асн. працы пра ўзаемасувязь малекулярных структур палімераў з іх фіз.-мех. ўласцівасцямі. Даследуе працэсы трэння і зносаўстойлівасці пластмас. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Медаль імя Вакансона (навук.-інж. т-ва Францыі).



Тв.: (Разам з А. І. Свірыдзёнкам і С. В. Шчарбаковым) Зубчатые передачи из пластмасс, Мн., 1965.

БЕЛЫ БОР, вёска ў Лёзненскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр Горбаўскага с/с. За 25 *км* па Пд ад Лёзна, 65 *км* ад Віцебска, 24 *км* ад чыг. ст. Лёзна. 25 ж., двароў 6 (1970). Васьмігадовая школа, фельч.-ак. пункт, раздзільны дом, вет. пункт, адд. сувязі. У Айч. вайну вёску спалілі фашысты.

БЕЛЫ БУСЕЛ (Ciconia ciconia), птушка атрада гаплпастых. Даўж. да 110 *см*, размах крылаў да 225 *см*. Апярэнне белае з чорным на крылах. Водзяцца ў Сярэд. і Паўд. Еўропе, Паўн.-Зах. Афрыцы, Зах. і Усх. Азіі. На Беларусі па ўсёй тэр., але найбольш на Палессі (нар. назвы: буцян, бацян, чарнагуз). Прылятаюць у пач. красавіка. У вырай ляцяць у 2-й палове жніўня. Гняздуюцца на дахах будынкаў, радзей на высокіх дрэвах. Нясуць 2—5, часам 6 яец. Птушаняты выводзяцца ў канцы мая — пач. чэрвеня. Корміцца Б. б. жабамі, чарвякамі, насякомымі, мышамі, якіх збірае на лугах, балотах, каля рэк.

БЕЛЫ ВЕРШ, верш нерыфмаваны. Узнік у Італіі ў 16 ст. і называўся verso scolito літар. вызвалены (ад рыфмы). У Англіі атрымаў назву blank verse (blank пусты, свабодны). Англ. blank у франц. паэтыцы замянілі словам blanc «белы». З такім значэннем тэрмін і замацаваўся ў л-ры. Спачатку Б. в. карысталіся пераважна ў вершаваных драм. творах (У. Шэкспір, Ф. Шылер, А. Пушкін). Б. в. ёсць у творах (на лац. мове) С. Полацкага. Пашырыўся ў бел. л-ры 20 ст. (Я. Купала, М. Багдановіч, М. Танк, У. Дубоўка, А. Куляшоў). Напр.:

Слых, як звон з высокае званіцы,
Слых, як на вадзе кругі ад камня,
Слых, як вецер, аблятае светам...
(М. Танк, «Люцыян Таполя»).

БЕЛЫ ВОЛАТ, парода трусоў. Выведзена ў Германіі. Поўсць густая, белая, бліскучая, вочы чырвоныя. Сярэдняя маса 5 *кг*, даўж. тулава да 67 *см*, абхват грудзей да 37 *см*. Плоднасць 6—8 трусянят за акот. Шкуркі выкарыстоўваюцца ў натуральным выглядзе і імітуюцца пад каштоўную пушніну. Гадуюць у Еўропе. У СССР завезены ў 1927. Плануюцца для БССР парода. Іл. гл. на ўкл. Пароды трусоў да арт. *Трусагадоўля.*

БЕЛЫ ПУХОВЫ ТРУС, парода трусоў. Выведзена ў СССР; як парода зацверджана ў 1957. Сярэдняя маса 4 *кг*, плоднасць 6—8 трусянят за акот. Дае 320—420 *г* (з прыплодам да 1100 *г*) пуху за год.

«БЕЛЫЯ», кансерватыўна-ліберальная плынь у лагеры польскага нац.-вызв. руху напярэдадні і ў час паўстання 1863. У адрозненне ад *«чырвоных»* «Б.» выступалі супраць узбр. паўстання. Баючыся нар. рэвалюцыі і арыентуючыся на дапамогу ўрадаў вах. дзяржаў, яны спадзяваліся шляхам паліт. камбінацый дамагчыся ад царскага ўрада ўступак і аднаўлення Польшчы ў межах 1772. Партыя «Б.» аформілася ў канцы 1861. У Царстве Польскім яна складалася з буйной шляхты і гандл.-фін. буржуазіі, на Беларусі і ў Літве — амаль выключна з памешчыкаў. Іх кіруючы орган — Дырэкцыя. Арганізацыя памешчыкаў на Беларусі і ў Літве пачала афармляцца ў 1860, пастаянны камітэт «Б.» у Вільні ўтвораны ў вер. 1862. Баючыся, каб паўстанне 1863—64 у Польшчы, на Беларусі і ў Літве не перарасло ў нар. рэвалюцыю, «Б.» далучыліся да яго. 27.2(11.3).1863 яны абвясцілі дыктатуру свайго стаўленіка М. Лянгевіча. Адначасова заханілі паўстанцкую ўладу ў Літве і на Беларусі. Замест «чырвонага» *Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі* быў утвораны з прадстаўнікоў «Б.» *Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы.* Не вытрымаўшы рэпрэсій царскіх улад, летам 1863 «Б.» сталі адыходзіць ад паўстання. У ліп. 1863 «чырвоныя» Літвы і Беларусі на чале з К. Каліноўскім зноў узялі ў свае рукі рэвалюц. ўладу. Царскі ўрад выкарыстаў часовы ўдзел памешчыкаў у паўстанні для аслаблення польскага землеўладання на Беларусі і ў Літве.


Літ.: Гл. пры арт. *Паўстанне 1863—64.* *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

БЕЛЫЯ БАЛАТЫ, вёска ў Лойкаўскім с/с Гродзенскага р-на, на левым беразе р. Нёман. Цэнтр калгаса «22 верасня». За 23 *км* на Пн ад Гродна. 139 ж., двароў 35 (1970). Пач. школа, б-ка, фельч.-ак. пункт.

БЕЛЫЯ ЗЕМЛІ (абеленыя, абельныя), землі феадалаў у Рускай дзяржаве 16—17 ст., насельніцтва якіх вызвалялася ад дзярж. падаткаў і павіннасцей.

Б. з. лічыліся асабістыя паншчыя ўгоддзі і землі памешчыкаў, якія неслі вайск. службу. У гарадах памешчыкаў, якія неслі вайск. службу. У гарадах памешчыкаў, якія неслі вайск. службу. У гарадах

БЕЛЬВЕДЭР (італьян. belvedere літар. прыгожы від), невялікая, круглая ў плане вежа на будынку ці на ўзгорку ў парку, дзе яна



Бельведэр на адміністрацыйным будынку ў Мінску.


часта завяршае пейзажную перспектыву. У рус. архітэктуры Б. шырока выкарыстоўваўся пры буд-ве палацаў.

БЕЛЬГІЙСКАЯ КАРАЛЕЎСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК, ЛІТАРАТУРЫ І ПРЫГОЖЫХ МАСТАЦТВАЎ, заснавана ў 1772, знаходзіцца ў Бруселі. У складзе АН (1967) 86 членаў і 36 чл.-кар. Мае 10 секцый (1967): матэм. і фіз. навук, прыродазнаўчых навук, гісторыі і л-ры, маралі і паліт. навук, жывапісу, скульптуры, гравюры, архітэктуры, музыкі, крытыкі. Выдае «Mémoires» («Мемуары», з 1779), «Bulletin» («Бюлетэнь», з 1832), «Annuaire» («Штогоднік», з 1835).

БЕЛЬГІЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ 1830, бурж. рэвалюцыя ў бельгійскіх абласцях Нідэрландскага каралеўства, якая паклала пачатак незалежнасці Бельгіі.

Пасля падзення напалеонаўскай імперыі бельг. тэрыторыя была аб'яднана з Галандыяй у адзінае каралеўства Нідэрланды. Аднак процілегласць інтарэсаў бельг. прамысловасці і галандскіх аграрыяў і гандляроў, нераўнапраўнае становішча бельг. насельніцтва, рэліг. супярэчнасці паміж бельгійцамі (католікі) і галандцамі (пратэстанты) прывялі ў жн.—вер. 1830 да ўзбр. паўстання. Амаль уся Бельгія была вызвалена ад галандскіх войск. Уладу захапіла буржуазія, якая ўсталявала неўзабаве (1831) рэжым канстытуцыйнай манархіі. 20.12.1830 пяць вялікіх дзяржаў — Англія, Аўстрыя, Прусія, Расія, Францыя — прызналі незалежнасць Бельгіі.

БЕЛЬГІЯ (Belgique; Belgie), дзяржава ў Зах. Еўропе на паўд. узбярэжжы Паўночнага мора. Пл. 30,5 тыс. км². Нас. 9609 тыс. чал. (31.12.1967). Падзяляецца на 9 правінцый. Сталіца Брусель.



Дзяржаўны лад. Б.— канстытуцыйная манархія. Дзейнічае канстытуцыя 1831. На чале дзяржавы стаіць кароль. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляюць кароль і парламент, які складаецца з 2 палат — палаты прадстаўнікоў і сената. Выканаўчая ўлада належыць ураду. Мясц. кіраванне ажыццяўляюць у правінцыях губернатары, у кантонах (абшчынах) — камісары. У правінцыях і абшчынах ёсць выбарныя муніцыпальныя органы — правінцыяльныя і камунальныя саветы. Судовая сістэма: касацыйны суд, апеляцыйныя суды, суды першай інстанцыі, міравыя суддзі.

Прырода. Паверхня пераважна раўнінна-ўзгорыстая. На ПдУ старажытны (герцынскі) масіў Ардэны (г. Батранж, 694 *м*). На Пн ад яго нешырокая палоса раўнін і плато, складзеных з палеагенавых глінаў і пяскоў. Астатнюю частку Б. займаюць плоскія нізіны Фландрыі і Кампіна, укрытыя чацвярцічнымі рачнымі і марскімі адкладамі. Есць кам. вугаль (каля 23 млрд. *т*), фасфарыты, буд. матэрыялы. Клімат марскі, умерана цёплы. Сярэд. т-ра студз. 3 (у Ардэнах —1,0 °С), ліп. 18 °С (у Ардэнах 14 °С). Ападкаў 750—800 *мм* за год, у Ардэнах да 1500 *мм*. Рэкі паўнаводныя, не замярзаюць. Галоўныя: Шэльда і Маас. Прамысл. цэнтры злучаны паміж сабою рэкамі і каналамі, на якіх пабудавана многа шлюзаў. Пераважае культ. расліннасць, лясы (15% пл. Б.) у Ардэнах. Карту гл. на ўклейцы.

Насельніцтва. Па нац. прыналежнасці нас. Б. падзяляецца на 2 асн. групы: фламандцы (каля 53%) на Пн і валоны (каля 41%) на Пд. Фламандцы па мове і культуры блізкія да галандцаў. Валоны блізкія да французаў, гавораць на паўн. дыялекце франц. мовы. Франц. і фламанд. мовы — дзяржаўныя. Жывуць таксама італьянцы, немцы, французы, палякі, іспанцы. Амаль усе веруючыя — католікі. Б.— адна з найбольш густа населеных краін свету (шчыльн. 315 чал. на 1 км²). Гарадскога нас. больш за 85%. Найбольшыя гарады (у тыс. ж., з прыгарадамі, 1966): Брусель — 1299 (агламерацыя з гарадамі Андэрлехт і Схарбек), Антверпен — 662, Шарлеруа — 472 (1964, без прыгарадаў у 1961—26), Льеж — 450, Гент — 233.

Гістарычны нарыс. Паводле археал. звестак чалавек на тэр. Б. жыў з часоў палеаліту. Каля 3 ст. да н. э. пачалося засяленне кельцкімі плямёнамі белгаў (адсюль назва краіны). У 57 да н. э. землі белгаў заваяваў Юлій *Цэзар*, яны сталі ўскраінай Рымскай дзяржавы. У 1—4 ст. н. э. на тэр. Б. фарміруецца рабаўласніцкі ўклад. У выніку далейшага засялення (3 ст.) герм. плямёнамі франкаў, фрызаў і саксаў, змяшання плямёнаў пачалі складвацца дзве народнасці: валоны (патомкі раманізаванага племені белгаў) і фламанд-

Антверпен. Помнік П. П. Рубенсу.



ды (патомкі герм. плямёнаў). У 5—9 ст. тэр. Б. ў складзе *Франкскай дзяржавы*, а пасля распаду імперыі Каралінгаў (843) паступова падзялілася на шэраг феад. уладанняў: графствы Фландрыя (у складзе Зах.-франкскага каралеўства), Эно, Лімбург, Намюр, Люксембург, герцагства Брабант, епіскапствы Льеж, Камбрэ, Турнэ. З 10 ст. развіваюцца гарады Гент, Бруге, Іпр, з 11—12 ст. Антверпен, Брусель і інш. У 12—13 ст. у Фландрыі і Брабанце хутка расце прамысловасць. Яны становяцца цэнтрамі міжнар. гандл. сувязей. Рост таварна-грашовых адносін і спрадневяковай гарадской культуры прывёў да замены паншчыны і *серважа* адольшчынай і грашовай арэндай да больш раняга, чым у іншых краінах Еўропы, разлажэння феад. адносін. У 15 ст. тэр. Б. адышла да Бургундскага герцагства, пасля яго распаду — да Нідэрландаў, у 1477—82 — да імперыі Габсбургаў. З 1555 стала уладаннем ісп. манархіі. Ранняя бурж. рэвалюцыя 16 ст. ў Нідэрландах (гл. *Нідэрландская буржуазная рэвалюцыя*) на тэр. Б. не мела поспеху, там было адноўлена ісп. панаванне. У 1714 Іспанію Нідэрланды (тэр. Б.) адышлі да аўстр. манархіі. Яе палітыка нац. прыгнёту бельг. насельніцтва выклікала глыбокае нездавальненне і была прычынай нац.-вызв. руху, які перарос у Брабанцкую рэвалюцыю 1789—90. У ходзе яе было вызвалена некалькі бельг. правінцый. 11.1.1790 Нац. кангрэс, скліканы ў Бруселі, абвясціў незалежнасць Злучаных Штатаў Бельгіі. Скарыстаўшы ўнутр. барацьбу сіл, якія захапілі ўладу ў краіне, і дапамогай арміі аўстр. Габсбургі аднавілі (1791) сваю ўладу ў бельг. правінцыях. Тэрыторыя Б. зноў была вызвалена пасля перамогі (1792) франц. рэвалюц. войск над аўстрыйскімі. Паўторна растаўрыраваная (з сак. 1793) у бельг. правінцыях аўстр. ўлада скончылася ў выніку паражэння аўстрыйцаў у бітве з франц. войскамі 26.6.1794 пры Флёрусе. 1.10.1795 абвешчана далучэнне Б. да Франц. рэспублікі. Аўстрыя прызнала гэты акт у 1797 (Кампафармійскі мір). Паводле рашэння *Венскага кангрэсу 1814—15* бельг. правінцыі былі штучна аб'яднаны ў 1815 з Галандыяй у каралеўства Нідэрланды. Незадаволенасць насельніцтва бельг. правінцый галандскім панаваннем вылілася ў бурж. *Бельгійскую рэвалюцыю 1830*. Б. стала незалежнай. Незалежнасць спрыяла хуткаму развіццю капіталізму, росту рабочага класа. У сярэдзіне 19 ст. ўзніклі рабочыя арг-цыі, у 60-я г.— бельг. секцыі 1-га Інтэрнацыянала. Працоўныя дамагліся права на забастоўкі (1866), адмены забароны рабочых саюзаў (1867). У канцы 19 — пач. 20 ст. Б. становіцца малой імперыяй. дзяржавай, буйным экспарцёрам прамысл. тавараў і капіталу. Толькі ў Расію да 1914 вывезена 6 млрд. франкаў. Бельг. каланізатары захапілі ў 70—80-я г. 19 ст. частку бас. Конга (з 1908 афіц. калонія Б.). Рост рабочага руху ў гэты перыяд адзначаны васн. Бельг. сацыяліст. партыі (1879). На аснове яе ў 1885 створана Бельг. рабочая партыя. У 1893, 1902 і 1913 яна была арганізатарам паліт. стачак за ўсеагульнае выбарчае права.

У 1-ю сусв. вайну Германія парушыла нейтралітэт Б. і акупавала амаль усю яе тэрыторыю. За 4 гады акупацыі эканоміцы краіны прычынены вялікія страты. Бельг. калан. войскі разам з англ. і франц. ўдзельнічалі ў вайне ў Еўропе і ў захопе герм. уладанняў у Афрыцы. Паводле *Версальскага мірнага дагавору 1919* Б. атрымала герм. акругі Эйпен і Мальмеды, у Афрыцы — мандат на Руанда-Урундзі, а таксама права на рэпарацыі. Б. адыгрывала важную ролю ў Версальскай сістэме, як партнёр імперыялістаў. Францыі ўдзельнічала ў акупацыі Рура ў 1923. Да 1935 адмаўлялася ўстанавіць дыпламат. адносіны з СССР. Міжваенны перыяд характарызуецца ўзмацненнем рабочага руху, які вымусіў буржуазію крыху палепшыць умовы жыцця працоўных, расшырыць выбарчыя правы. У 1919 у краіне ўзніклі першыя камуніст. арг-цыі. На іх базе ў 1921 створана Камуніст. партыя Бельгіі (КПБ).


Сусв. эканам. крызіс 1929—33 выклікаў заняпад бельг. эканомікі. Рэака зменшыліся вытворчасць і экспарт, зарплата рабочых знізілася на 35—40%, у канцы 1938 было больш за 432 тыс. беспрацоўных. У знешняй палітыцы бельг. ўрад пайшоў на збліжэнне з Германіяй і Італіяй, адмовіўся ад стварэння сістэмы калект. бяспекі ў Еўропе, што спрыяла развязванню 2-й сусв. вайны. 10.5.1940 герм. войскі ўварваліся ў Б. Яе ўрад папрасіў дапамогі ў Англіі і Францыі. Апошнія накіравалі свае войскі ў Б., але 28 мая бельг. кароль Леапольд III падпісаў акт пра капітуляцыю. У гады акупацыі КПБ (адзіная з усіх партый) узначаліла патрыят. сілы краіны, арганізавала Рух Супраціўлення. Ва ўмовах шырокага наступлення сав. войск на герм. фронце і поспехаў сіл бельг. Супраціўлення англа-амер. войскі вызвалілі (вер. 1944) Б. У лют. 1945 камуністы ўвайшлі ва ўрад. Пасля вайны працоўныя Б. дамагліся шэрагу поспехаў (закон пра сац. страхаванне, выбарчыя правы для жанчын, чыстка дзярж. устаноў ад асоб, якія памагалі гітлераўцам). Але ўжо ў 1947 сілы рэакцыі, якія аб'ядналіся вакол Сацыяльна-хрысціянскай і і Ліберальнай партый, павялі наступленне на заваёвы рабочых. Камуністы вымушаны былі выйсці (1947) з урада. Наступленне на паліт. і эканам. правы працоўных выклікала шырокія пратэсты (155 стачак у 1948, 700-тысячная забастоўка 1950, усеагульная забастоўка шахцёраў 1956, будаўнікоў і шахцёраў 1957, мільённая забастоўка 1960, гарнякоў правінцыі Лімбург 1966, 12-тыдзённая забастоўка на заводах «Арбед» у Генце і 114-дзённая на заводзе «Пінок-Пакс» у Херстале 1967).

З 1945 Б.— член ААН. Уваходзіць у сістэму створаных з удзелам ЗША агрэс. груповак. З 1949 — чл. *Арганізацыі паўночнаатлантычнага дагавору* (НАТО). Пасля выхаду Францыі з ваен. арг-цыі НАТО Б. дазволіла (1966) размясціць на сваёй тэр. асн. натаўскія штабы. У 1957 Б. ўвайшла ў «Агульны рынак» (гл. *Еўрапейскае эканамічнае таварыства*), у 1955 — у *Заходнееўрапейскі саюз*. Удзел у «Агульным рынку», вялікія ваен. выдаткі (у 1967 — 22,7 млрд. франкаў), пранікненне замежнага, пераважна амер., капіталу прывялі краіну да глыбокай эканам. дэпрэсіі. Класавая барацьба ў Б. абвастрылася нац.-лінгвістычнай праблемай, у аснове якой ляжыць нераўнамернае эканам. развіццё Фландрыі і Валоніі. У студз. 1968 адбылася дэманстрацыя студэнтаў-фламандцаў Лувенскага ун-та супраць расшырэння факультэтаў з навучаннем на франц. мове. Выступленні студэнтаў мелі месца ў Антверпене, Бруге, Генце і Маліне. Нац.-лінгвістычнае пытанне выклікала рознагалоссі паміж партыямі і ўнутры іх, самы доўгі ў гісторыі Б. ўрадавы крызіс. У сак. 1968 адбыліся нечарговыя парламенцкія выбары, у чэрв. сфарміраваны ўрад (з прадстаўнікоў Сацыяльна-хрысціянскай і Сацыялістычнай партый). Правыя сацыялісты адстойваюць прынцыпы дэцэнтралізацыі ўлады ў рамках унітарнай Б. КПБ і дэмакр. сілы змагаюцца за федэратыўнае ўладкаванне краіны, шырокія паўнамоцтвы мясцовых органаў улады. Нац.-вызв. барацьба народаў Афрыкі прымусіла Б. даць 30.6.1960 паліт. незалежнасць Конга (Кіншаса),

1.7.1962 — Руанда-Урундзі, на тэр. якой утварыліся дзве дзяржавы: Руанда і Бурундзі. Аднак бельг. неакаланіялісты імкнуцца захаваць свае пазіцыі ў Афрыцы.

Асноўныя палітычныя партыі і прафсаюзы. Сацыяльна-хрысціянская партыя. Створана ў 1945 на базе былой каталіцкай партыі. Бельгійская сацыялістычная партыя. Засн. ў 1885. Уваходзіць у *Сацыялістычны інтэрнацыянал*. Каля 200 тыс. чл. (1969). Партыя свабоды і прагрэсу (ПСП). Засн. ў 1961 на базе Ліберальнай партыі. 100 тыс. чл. Камуністычная партыя Бельгіі (КПБ). Засн. ў 1921. 15 тыс. чл. Старшыня М. Друмо. Усеагульная федэрацыя працы Бельгіі. Аб'яднуўвае 15 галіновых прафсаюзаў. Уваходзіць у *Міжнародную канфедэрацыю свабодных прафсаюзаў*. Канфедэрацыя хрысціянскіх прафсаюзаў. Уваходзіць у *Сусветную канфедэрацыю працы*.

Гаспадарка. Б.—высокаразвітая капіталіст. дзяржава. Па прадукцыі некат. галін прамысловасці (чорныя і каляровыя металы, апрацаваныя алмазы, вырабы са шкла) займае адно з першых месц сярод капіталіст. краін. Гал. роля ў эканоміцы належыць мясц. і замежным прамысл.-фін. манаполіям. Металургія, машынабудаванне, хім. і энерг. прамысловасць даюць 56% усёй валавой прамысл. прадукцыі. Меншае значэнне маюць галіны лёгкай прамысл.—тэкст., харч., папяровая і інш. Здабываецца каменны вугаль (14,8 млн. *т*, 1968; 30 млн. *т*, 1950) у паўн. басейне (прав. Лімбург) і паўд. (раён гарадоў Монс, Намюр, Льеж). Вугаль выкарыстоўваецца ў выт-ве. коксу (6,9 млн. *т*, 1966) і электраэнергетыцы (25,0 млрд. *квт·гадз*, 1968), аднак у энерг. балансе яго ўдз. в. (40%) меншая, чым нафты (каля 50%). Агульная магутнасць нафтаперапр. з-даў каля 23 млн. *т* за год; перапрацавана 22,7 млн. *т* (1968). Гал. цэнтр нафтаперапрацоўкі Антверпен. Прадпр. чорнай металургіі (выплаўлена ў 1968 чыгуну 10,3 млн. *т*, сталі 11,5 млн. *т*) сканцэнтраваны ў т. зв. «чорным поясе» ад Монса да Льежа. Каляровая металургія развіта на Пн (выплаўлена ў 1968 медзі 344 тыс. *т*, цынку 249 тыс. *т*, свінцу 110 тыс. *т*). Шматгаліновую структуру мае машынабудаванне: транспартнае — Льеж і Шарлеруа (лакаматывы); Нівель, Бруге, Цюбіз (вагоны); Антверпен і Хобакен (суднаверфі); Антверпен і Гент (зборка аўтамашын, 634 тыс. шт., 1968). Развіты эл.-тэхн. прамысл., станкабудаванне, тэкст. машынабудаванне, ваенная прамысл. і інш. Б. вядома шкларобнай (правінцыя Эно) і алмазагранільнай (Антверпен) прамысловасцю. Ёсць цэментныя (5,7 млн. *т*, 1968), хім. (звязаны азот, 448 тыс. *т*, кіна-, фотаматэрыялы) і інш. прадпр. З галін лёгкай прамысл. найбольш развіта тэкстыльная. У правінцыях Зах. і Усх. Фландрыі дробныя і сярэднія прадпр. заняты вытворчасцю амаль усіх відаў пражы і тканін з воўны (35 тыс. *т*, 1968), бавоўны (71 тыс. *т*), лёну, штучнага валакна. Развіта вытворчасць мукі, цукру, маргарыну, мясных і малочных прадуктаў. С. гасп. высокаінтэнсіўная. Пераважаюць дробныя і сярэднія гасп., больш за $^2/_3$ іх арандаваных землях. 10% усіх гаспадарак з участкамі 5—20 *га* маюць звыш $^1/_2$ усёй зямлі, якая апрацоўваецца, большую частку тэхнікі і даюць асн. таварную прадукцыю. $^2/_3$ усёй с.-г. прадукцыі дае жывёлагадоўля. Пераважае (1968) буйн. раг. жывёла — 2,8 млн. (у т. л. кароў 1,06 млн.), свіней 2,5 млн. галоў. Атрымана малака 4,1 млн. *т* (1968), масла ў 1967 82 тыс. *т*, сыру 39 тыс. *т* (1966). Паляводства спецыялізуецца на фуражных культурах і збожжавых на корм. Пасевы (1967) пшаніцы (230 тыс. *га*, збор 829 тыс. *т*), ячменю (146 тыс. *га*, 623 тыс. *т*), аўса (99 тыс. *га*, 361 тыс. *т*), бульбы (57 тыс. *га*, 1948 тыс. *т*), цукр. буракоў (65 тыс. *га*, 3616 тыс. *т*), лёну. Пашраны агародніцтва, садоўніцтва, кветкаводства. Па гушчыні чыг. сеткі Б. займае 1-е месца ў свеце. Даўж. чыгунак 6,6 тыс. *км*, суднаходных рэк і каналаў 1587 *км*. Танаж марскога гандл. флоту 835 тыс. бр. рэг. *т* (1968). Гал. порт Антверпен (грузааварот 71 млн. *т*, 1968). Даўж. шашэйных дарог 45 тыс. *км*. Гал. аэрапорты: Антверпен, Брусель, Остэндэ. Б. пакрывае за кошт імпарту $^1/_2$ патрэб у харч. прадуктах, $^2/_3$ патрэб у прамысл. сыравіне і паліве (нафта, руда, алмазы, бавоўна, воўна). Каля паловы экспарту прыпадае на металы, машыны, абсталяванне. Вывозіць таксама тэкстыль, шкло, цэмент, кіна- і фотаматэрыялы, брыльянты. Гал. гандл. партнёры Б.: краіны «Агульнага рынку» (ЕЭТ) — Нідэрланды, ФРГ, Францыя, Італія. На краіны ЕЭТ (1967) прыпадае 56% імпарту і 63% экспарту Б. У 1966 Б. наведала больш як 6 млн. турыстаў. Грашовая адзінка — бельг. франк.



Узброеныя сілы Б. складаюцца з сухап. войск, ВПС і ВМС. Вярх. галоўнакамандуючы — кароль. Налічвалі (1968) 107 тыс. чалавек. Сухап. войскі (83,5 тыс. чал.) маюць сучасную амер. зброю і ўваходзяць у склад узбр. сіл НАТО, дыслацыруюцца на тэр. ФРГ. ВПС (каля 20 тыс. чал., 280 баявых самалётаў, пераважна амер. вытворчасці) уваходзяць у склад аб'яднаных ВПС НАТО. ВМС (да 5 тыс. чал.) маюць каля 80, пераважна малых, караблёў. Ёсць 14 авіябаз, якія выкарыстоўваюцца здзельнікамі НАТО.

Ахова здароўя. Мед. абслугоўванне дзяржаўнае і прыватнае. На канец 1962 было 75 372 бальнічных ложкі (8,2 на 1000 чал. насельніцтва). У 1965 было 13 425 урачоў, акрамя таго 1143 зубныя, 3788 акушэрак. Рыхтуюць урачоў мед. факультэты ун-таў у Бруселі, Генце, Льежы, Лувене. У 1965 нараджальнасць склала 16,5, смяротнасць 12,5 на 1000 чал. насельніцтва; дзіцячая смяротнасць 25,8 на 1000 жыванароджаных. Найбольш пашыраныя інфекцыйныя хваробы: інфекцыйны гепатыт, шкарлятына, брушны тыф і паратыфы.

Асвета. У Б. школы дзвюх сістэм: дзярж. і прыватныя каталіцкія; колькасць вучняў у іх прыкладна адпаўкавая. Выкладанне на франц. (на поўдні) і флам. (на поўначы) мовах. У 1914 прыняты закон пра ўсеагульнае навучанне дзяцей з 6 да 14 гадоў. Дашкольныя ўстановы для дзяцей 3—6 гадоў. Пач. школа 6-гадовая. У 1966/67 навуч. г. ў дзярж. пач. школах займалася 1 006 425 вучняў. Сярэднія школа 6-гадовая, мае 2 ступені: першую (3-гадовая, аддзяленні: лаціна-грэч., агульнае і дапрафесіянальнае) і другую (3-гадовая, аддзяленні: лаціна-грэч., лаціна-матэм., лаціна-прыродазнаўчае, эканамічнае, прыродазнаўчае). У 1966/67 навуч. г. ў дзярж. сярэд. школах вучылася 119 431 чал. Прафесіян.-тэхн. школы 6-гадовыя на базе 1-й ступені сярэдняй школы. У 1966/67 навуч. г. ў іх займалася 324 071 чал. Настаўнікаў пач. школ і выхавальнікаў дзіцячых садоў рыхтуюць 4-гадовыя пед. вучылішчы на базе 1-й ступені сярэд. школы, выкладчыкаў сярэдніх школ — ун-ты. У 1966/67 навуч. г. ў пед. вуч. займалася 9082 чал.; у 4 ун-тах (у Генце, Льежы, Бруселі і каталіцкім у Лёвене) і 20 інш. ВНУ — 53 702 студэнты. У Б. 28 вялікіх б-к, у т. л. Бельг. нац. б-ка ў Бруселі, б-ка ун-та ў Лёвене; 39 музеяў (Каралеўскі музей прыгожых мастацтваў і Музей гісторыі мастацтваў у Антверпене, Дом П. П. Рубенса ў Антверпене, Муніцыпальная маст. галерэя ў Бруге, Музей прыгожых мастацтваў і Музей Цэнтр. Афрыкі ў Бруселі і інш.). У Бруселі — *Бельгійская каралеўская акадэмія навук, літаратуры і прыгожых мастацтваў*.

Друк, радыё, тэлебачанне. У Б. выдаваліся (1965) 54 штодзённыя газеты. Найб. вядомыя: «La Libre Belgique» («Свабодная Бельгія») — аблюстроўвае погляды Сацыяльна-хрысціянскай партыі; «Het Laatste Nieuws» («Апошнія навіны») і «La Dernière Heure» («Апошняя гадзіна») — адлюстроўваюць погляды Партыі свабоды і прагрэсу; «Le Peuple» («Народ») — орган Сацыяліст. партыі; «Le Soir» («Вечар») і інш. Органы Камуніст. партыі Бельгіі — газ. «Le Drapeau Rouge» («Чырвоны сцяг», на франц. мове), «De Rode Vaan» («Чырвоны сцяг», на флам. мове), час. «Communisme» («Камунізм»). Асн. крыніца інфармацыі — Агенцтва Бельгія.

Літаратура развівалася на дзвюх мовах: у паўд. правінцыях на французскай, у паўн.— на фламандскай.

Л-ра на франц. мове, асабліва 13—17 ст., з'яўляецца таксама набыткам культуры Францыі. Першыя помнікі адносяцца да 1200. У 15 ст. паявілася рэаліст. навела («Сто новых навел» А. дэ ла Саля). Адраджэнне ў Б. прыпадае на 16 ст. (гуманіст Ж. Лемер дэ Бельж, паэты А. дэю Эке, Л. дэ Мазюр). У 17 ст. наглядаецца заняпад л-ры Б. У 2-й пал. 18 ст. распаўсюджваюцца ідэі франц. Асветніцтва (паэты А. Б. Рэйнье, Ж. Н. Басанж). З пач. 19 ст. пануе рамантызм (крытык А. Барон, паэт і драматург А. ван Гасельт). Вылучыўся майстар паліт. сатыры рэаліст. кірунку Т. Вёстэнрад. А. Мок, Ж. дэ Сен-Жэнуа, Ж. Б. Каманс развіваюць гістар. раман. У 2-й пал. 19 ст. пераважаюць рэаліст. тэндэнцыі (паэты Ф. Стэвенс, А. Клес, раманісты Ж. Дэмулен, Э. Леклерк).

Вяршыня бельг. рэалізму — творчасць Ш. *дэ Кастэра*, прасякнутая рэвалюц. ідэямі. У 80-я г. за нац. самастойнасць л-ры Б. выступіла літ. група «Маладая Бельгія», але многія яе члены абаранялі аналітычнасць мастацтва (М. Валер, І. Жылькен, М. *Метэрлінк*). У 90-я г. паявіўся сімвалізм (Метэрлінк, Ж. *Радэнбах*, А. Макель, Ш. ван Лерлінк, Ж. Кыро). Э. *Верхарн* пераадолеў сімвалісцкі суб'ектывізм і ў лепшых творах адлюстроўваў рэвалюц. рух эпохі. У пач. 20 ст. пераважае т. зв. рэгіянальны раман пра побыт і норавы асобных раёнаў Б. (М. Дэзамб'ё, Ж. Гарнір, Ж. Вірэс). Жыццё гарадской беднаты паказана ў раманах Ю. Крэнса, Л. Дэнаты паказана ў раманах Ю. Крэнса, Л. Дэлатра, Н. Доф. Сацыяліст. ідэі гучаць у Ж. Дэстрэ, М. Рэнара, Ф. Магюта. Дэмакратычныя традыцыі прадаўжаў Ф. Эленс, які знаходзіўся пад уплывам М. Горкага. У перыяд фаш. акупацыі паэт-камуніст Р. Блік (загінуў у канцлагеры) апяваў мужнасць антыфашы-

стаў. Гэтая тэма адлюстравана ў паэзіі Ж. Варэна, І. Гасель, Ш. Муаса, раманах Д. Жылеса, Д. Шайнерта. З дэмакр. і гуманіст. традыцыямі звязана лірыка А. Бернье, М. Карэма, Ж. Норжа, Ж. дэ Башэра.

Флам. л-ра да 18 ст. была часткай нідэрл. л-ры (гл. *Нідэрланды*, раздз. Літаратура). З усталяваннем франц. культуры ў Б. нац. флам. культура перажывае заняпад, яе традыцыі захоўваюцца ў фальклоры. У пач. 19 ст. з нац. і дэмакр. уздымам г. Гент зрабіўся цэнтрам флам. рамантызму (паэт, гісторык і філолаг Я. Ф. Вілемс, паэт К. Л. Ледэганк). Рамантык Х. Кансіянс у гістар. і сац.-бытавых раманах выступіў пачынальнікам рэаліст. кірунку. У 2-й пал. 19 ст. развіваецца крытычны рэалізм (сац. раманы Д. Слекса, В. Ловелінг, А. Бергмана). Паэт Ю. дэ Гейтэр выдаў зб. антыклерыкальных «Песняў Гёзаў». Паэзія Г. Гезеле ўвасобіла містыка-рэліг. настрої. У 80-я г. ўзнік рух «васьмідзесятнікаў», якія імкнуліся ўвесці ў л-ру грамадз. праблемы. Творчасць С. Бойсе і С. Стровелса прысвечана жыццю сялян. Э. дэ Бом стварыў першы псіхалаг. раман «Абломкі» (1898). У рэчышчы натуралізму пісаў раманы пра капіталіст. горад Л. Бакелманс. У пач. 20 ст. вядучую ролю набылі дэкадэнцкія школы (Х. Тэйрлінк, К. ван дэ Вустэйне, А. Вермейлен). Пад уплывам ідэй навук. сацыялізма знаходзіўся паэт Р. дэ Клерк, які пісаў пра барацьбу пралетарыяту. Пачынальнікам экспрэсіянізму быў паэт П. ван Астаен. У 30-я г. супраць экспрэсіянізму выступалі М. Рулантс, М. Гейсен, Г. Валсхап. Дэмакратызмам прасякнуты творы паэта і раманіста В. Элсхара.

Пасля 2-й сусв. вайны паявіліся пісьменнікі, якія актыўна выступаюць за мір і дэмакратыю, супраць фашызму і каланіялізму (празаікі Л. П. Бон, М. Дэйзе, П. ван Акен, паэт-камуніст М. Брат, паэты В. Рэслінк, Х. Клаўс).

Архітэктура. У сярэднія вякі і эпоху Адраджэння Б. была адным з найважнейшых маст. цэнтраў Еўропы (гл. *Нідэрланды* Сярэдневяковыя). Пасля 16 ст. маст. культура Б. і Галандыі (гл. *Нідэрланды*) развівалася кожнай сваім шляхам. У 17 ст. Фландрыя становіцца адным з цэнтраў барока: дамы гільдый на Вялікай пл. ў Бруселі, Дом П. П. Рубенса ў Антверпене (праект 1611 і 1618). Архітэктарамі-езуітамі будуюцца новыя і перабудоўваюцца старыя цэрквы. Ствараюцца трохнефавыя ц.-базілікі з эмпорамі, трохчасткавым фасадам і вежай за хорам, багатым дэкорам: Сінт-Каролус-Барамеўскерк у Антверпене (1614—21), Трыніта ў Бруселі (1621, Ж. Франкарт), Сінт-Міхілскерк у Лёвене (1650—66, 1671); базілікі з ратондай: Онзе-ліве-Враў-ван-Хансвейк у Мехелене (1663—78). З'явіліся крэпасці ў Турнэ, Монсе, Намюры, Льежы. У 18 ст. пад уплывам франц. і венскага класіцызму будуюцца ў Бруселі: Верхні горад, Каралеўская пл. (1774—80), парк, палац і інш.; у правінцыі Эно — замак Сенеф (1760).



В. Буржуа. Пасёлак Сітэ-Мадэрн у Сінт-Агата-Берхем каля Бруселя. 1922—27.

Пашыраюцца «ланггевелхуве» (жылыя і гасп. будынкі пад адным дахам). У 19 ст. рэканструяваны цэнтр Бруселя. У буд-ве фабрык, заводаў, грамадскіх будынкаў і інш. выкарыстоўваюцца метал. канструкцыі, якія маскіруюцца дэкар. элементамі (вакзал у Турнэ, 1879). Асн. помнікі 19 ст.— Палацы юстыцыі ў Генце (1836—46) і Бруселі (1866—83, Ж. Пуларт). У 90-я г. пашыраецца стыль «мадэрн» (заснавальнік і тэарэтык Х. ван дэ Велдэ — дом у Ікле, 1895). Выкарыстоўваюцца метал і шкло, новыя канструкцыі. В. Арта ўводзіць характэрную стылю лінію «ўдар хлыстом»: Народны дом (1896—99) і магазін Інавасьён у Бруселі. Пасля 1-й сусв. вайны развіваецца муніцыпальнае буд-ва. Будуюцца шматпавярховыя даходныя дамы, малапавярховыя рабочыя пасёлкі (Сітэ-Мадэрн, 1922—27, В. Буржуа). Пасля 1945 узнікаюць гарады-спадарожнікі, будуюцца небаскробы, арх. комплексы (Плен-дэ-Манёўр у Льежы, 1956), павільёны Сусв. выстаўкі ў Бруселі (1958), квартал Сітэ-Мадэль (Брусель, 1966).

Выяўленчае мастацтва. Т. зв. фламандскае мастацтва, якое сфарміравалася ў 17 ст., спалучала пышнасць і параднасць барока з народнарэаліст. тэндэнцыямі (П. П. *Рубенс*, А. *ван Дэйк*, Ф. *Снейдэрс*, Я. *Іорданс*, Д. Тэнірс, А. *Браўэр*, Я. Брэйгель «Аксамітны» і інш.). У канцы 18 ст. развіваюцца класіцызм (А. Ленс, Ж. Л. Гадшарль), рэаліст. кірунак (Л. Дэфранс). Пасля рэвалюцыі 1830 складваецца ўласна бельг. мастацтва з мноствам плыняў, якому ўласцівыя драматызм, сімвалічныя абагульненні, цікавасць да вобразаў і жыцця людзей працы. Развіццё жывапісу пачалося з гістар. жанру (Ф. Ж. Навез). Узнікае рамант. школа (Х. Лейс). Пашырэнне рэалізму ў 2-й пал. 19 ст. і адыход ад салоннага мастацтва звязаны з «Свабодным таварыствам прыгожых мастацтваў», тэрвюрэнскай школай. Скульптар і жывапісец К. *Менье* адзін з першых у вах.-еўрап. мастацтве звярнуўся да тэматыкі прамысл. працы і жыцця рабочых. У канцы 19 ст. ўзнік імпрэсіянізм. Канец 19 — пач. 20 ст. характарызуецца пераходам да сімволікі і алегарызму (Ф. Ропс, майстры «1-й латэмскай групы»). У пач. 20 ст. пашыраецца экспрэсіянізм (майстры «2-й латэмскай групы»). Сусв. вядомыя антымілітарысцкія творы прагрэс. графіка Ф. *Мазереэля*. Пасля 2-й сусв. вайны пашырылася абстрактнае мастацтва. Прыкладное мастацтва Б.: кераміка, вітражы, апрацоўка металу, тканства, выраб карункаў, разьба па дрэве і інш.

Ж. Пуларт. Палац юстыцыі ў Бруселі. 1866—83. В. Арта. Лесвіца асабняка ван Этвелдэ ў Бруселі. 1897—99.





Музыка. У 15—16 ст. на тэр. сучаснай Б. існавала *Нідэрландская школа* (франка-фламандская), прадстаўнікі якой зрабілі ўплыў на фарміраванне царк. поліфанічных школ інш. еўрап. краін. З 17 ст. Б. траціць вядучую ролю ў муз. культуры Еўропы. Нац. музыка развіваецца пасля ўтварэння незалежнай дзяржавы ў двух кірунках—





А. Браўэр. Горкі напітак. 30-я г. 17 ст. Штэдэлеўскі мастацкі інстытут. Франкфурт-на-Майне (злева). Ф. Мазереэль. Сірэна. Гравюра на дрэве. 1932.

флам. (антверпенская школа) і валонскім. Кампазітары антверпенскай школы П. Бенуа, Я. Блокс, П. Жыльсон, Э. Тынель апіраліся на флам. фальклор і нім. музыку. Прадстаўнікі валонскага кірунку — Г. Л. Юберці, Г. Лекё, В. Урэльс, І. Іонген і інш.— арыентаваліся на франц. камічную оперу 18 ст., італьян. оперу-буфа, пазней на творчасць С. Франка, італьян. верыстаў. Найб. значныя дасягненні кампазітараў Б. ў жанры інстр. канцэрта, асабліва скрыпічнага. Гэта звязана з наяўнасцю бельг. школы скрыпічнай ігры, якая дала ў 19—20 ст. сусветна вядомых віртуозаў — Ш. Берыо, А. В'ётана, Э. Ізаі (яны і аўтары скрыпічных твораў), П. Марсіка і інш. З віяланчэлістаў вылучаецца Ф. Сервэ, з музыказнаўцаў — Ф. Ж. Фетыс і Ф. А. Геварт (19 ст.), Ш. ван дэр Борэн (20 ст.). Сучасныя бельг. кампазітары — Ж. Абсіль, Р. Дэфасэ, Ф. Кінэ, М. Пот і інш.; дырыжоры — Ф. Андрэ, Д. Дэфо; скрыпачы — А. Грум'ё, К. ван Нестэ. У Б. 5 дзярж. кансерваторый (Брусель, Льеж, Гент, Антверпен, Монс), а таксама гарадскія муз. акадэміі і ін-т царк. музыкі ў Мехелене. У Бруселі наладжваюцца міжнар. конкурсы піяністаў і скрыпачоў імя каралевы Лізаветы, у Льежы — кампазітарскага выканальніцтва, камерных твораў і смычковых інструментаў.

Тэатр. Сярэдневяковыя рэліг. абрады мелі тэатр. элементы. У 15—16 ст. т. зв. камеры рыторыў у сваіх пастаноўках (пераважна фарсах і маралітэ) на флам. мове праводзілі ідэі дзярж. незалежнасці. Гастраліравалі замежныя тэатр. трупы — франц., ісп. і інш. (16—17 ст.). Першы бельг. т-р «Дэ ла Манэ» адкрыты ў 1700 у Бруселі, меў оперную і драм. трупы. Пасля 1830 а'явіліся т-ры на флам. мове. Ставіліся рамант. драмы, водэвілі, развесляльныя п'есы. У канцы 19 — пач. 20 ст. вялікі ўплыў на бельг. т-р аказалі творчасць і эстэтыка сімвалістаў — М. Метэрлінка, Ш. ван Лербэрга і інш. У гады рабочага руху літ.-маст. секцыя Бельг. Нар. дома паставіла рэвалюц. драму Э. Верхарна «Зоры» (1898). У 20—30-я г. пашырыліся самадзейныя калектывы, якія ставілі прагрэс. творы. У гады нім. акупацыі браты Ж. і М. Хойсман арганізавалі вандроўны «Тэатр Супраціўлення». У Б. каля 50 прафесіян. т-раў, у т. л. каля 20 у Бруселі. Найб. значныя: «Дэ ла Манэ», «Дэю Парк», «Дэ Галеры», «Нацыянальны тэатр», «Дэю Рыдо», «Дэ Пош». У рэпертуары пераважае замежная драматургія.

Кіно. Вытворчасць фільмаў пачалася ў 1908, але спынілася 1-п сусв. вайна. З канца 20-х г. бельг. рэжысёры пад уплывам дасягненняў еўрап. кінамастацтва здымаюць эксперымент. фільмы, распаўсюджваюць новыя выразныя сродкі кінамастацтва. Пасляхова развіваецца дакумент. кіно. Вядомыя сталі відавыя, мастацтвазнаўчыя і этнагр. фільмы рэжысёраў А. Сторка, П. Хасартса і інш. Мастацкая кінематаграфія развіта слаба. З лепшых маст. фільмаў: «Чайкі паміраюць у гавані» (1957), «І ўжо ападае кволая кветка» («Дзеці Барынажа», 1960), «У цыгніку, аднойчы вечарам...» (1969).

Літ.: Панков Ю. Н. Современная Бельгия, М., 1963; Бюрнель Э. Трудящиеся Бельгии и Великая Октябрьская революция, пер. с франц., М., 1957; Ренар К. Октябрь 1917 года и бельгийское рабочее движение, пер. с франц., М., 1968; Шлеппнер Б. С. Сто лет социальной истории Бельгии, пер. с франц., М., 1959; Андреев Л. Г. Сто лет бельгийской литературы, М., 1967 (бібліягр.); Мицкевич Б. П. Шарль де Костер и становление реализма в бельгийской литературе, Мн., 1960; Рассказы бельгийских писателей, пер. с флам. и франц., М., 1968; Из современной бельгийской поэзии, пер. с франц., флам., валлон., М., 1965; Стихи бельгийских поэтов, пер. с франц., М., 1959; Всеобщая история искусств, т. 5—6 (кн. 1), М., 1964—65 [т. 5, с. 291—297, т. 6 (кн. 1), с. 161—170]; Всеобщая история архитектуры, т. 5, М., 1967, с. 477—498; Бельгийское искусство конца XIX—XX веков от Менье до Пермеке. Каталог, М., 1956; Голландская и фламандская живопись, Прага — Л., 1962; Laurent M. L'architecture et la sculpture en Belgique, Paris — Bruxelles, 1928; Kuyck H. van. Modern Belgian architecture, New York, 1946; Leirens Ch. La musique belge, 2 ed, Bruxelles, 1954; Wangermee R. La musique belge contemporaine, Bruxelles, 1959.

Ф. С. Фешчанка, Л. І. Яўстаф'ева (прырода, гаспадарка). Мінск, Масква; *М. П. Палетыка* (гістарычны нарыс). Мінск; *М. М. Максмахер, І. У. Валевіч* (літаратура), *Н. Л. Крашанінікава* (архітэктура, выяўленчае мастацтва), *Л. Р. Чудава* (музыка). Масква.

БЕЛЬКІ, вёска ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., на р. Паловіца (прыток Галбіцы). Цэнтр сельсавета. За 45 *км* на ПнУ ад Паставаў, 245 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Полава. 221 ж., двароў 75 (1970). Сярэдняя школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У Вял. Айч. вайну вёску спалілі фашысты. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

БЕЛЬМАН Хаім Лейвікавіч [н. 21.5(3.6). 1906, в. Астрагляды Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі неўрапатолаг. Д-р мед. н. (1954), праф. (1965). Чл. КПСС з 1944. У 1931 скончыў Дняпрапятроўскі мед. ін-т. У 1932—35 экстэрн клінікі нервовых хвароб 1-га Ленінградскага мед. ін-та, у 1946—64 старшы навук. супрацоўнік клінікі нервовых хвароб Ленінградскага псіханеўралагічнага ін-та імя Бехцерава. З 1964 заг. кафедры нервовых хвароб Гродзенскага мед. ін-та. Асн. працы па вывучэнні траўматычных абсцэсаў галаўнога мозгу, кляшчовага энцэфаліту, лячэнні парушэнняў мазгавога кровазвароту з дапамогай антыкаагулянтаў.

Тв.: Клещевой энцефалит, Л., 1960.
Літ.: Ефим Львович Бельман. «Журнал невропатологии и психиатрии им. С. С. Корсакова», 1967, т. 67, в. 4.

БЕЛЬСК, вёска ў Навасёлкаўскім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «За Радзіму». За 30 *км* на Пд ад Кобрына, 75 *км* ад Брэста, 32 *км* ад чыг. ст. Кобрын. 1071 ж., гасп. 348 (1970). Васьмігадовая шко-

ла, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны.

БЕЛЬСКІ Іосіф Аляксандравіч [8(21).9.1903, в. Лошыца Мінскага пав.— 25.6.1966], савецкі партыйны дзеяч, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1929. Працоўную дзейнасць пачаў рабочым-чыгуначнікам у 1917. З 1921 на сав. і парт. рабоце. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У 1941 скончыў Маскоўскую прамакадэмію. З першых дзён Айч. вайны ў тыле ворага, арганізоўваў партыз. рух у Мінскай вобл.; сакратар *Мінскага падпольнага абкома* КП(б)Б. З удзелам Б. ўтворана 63 пярвічныя падпольныя парт. арг-цыі ў партыз. атрадах Мінскай і Палескай абл. Паводле распрацаванага ім плана ў чэрв. 1942 партызаны разгромілі чыг. ст. Фалічы. Удзельнічаў у разгроме любанскага, кузьміцкага, лапавіцкага, пасталоўскага, скаўшчынскага варожых гарнізонаў, у падрыве чыг. мастоў на р. Пціч і інш. Пасля вайны сакратар Мінскага гаркома КП(б)Б, з 27.11.1948 старшыня Бел. рэспубліканскага савета прафсаюзаў. На XX—XXII з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 2, 4-га скл.



Літ.: Титов А. Дорога дружбы, Мн., 1958; Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Мн., 1959.


А. В. Сямёнава. Мінск.

БЕЛЬСКІ (Bielski) Марцін (1495, в. Бяла каля Серадза — 18.12.1575), польскі пісьменнік і гісторык. Самы вядомы яго твор — «Хроніка ўсяго свету» (1551), дзе апісаны сусв. падзеі ад дагістар. часу да пач. 16 ст. Побач з рэальнымі падзеямі і героямі ў ёй шмат фантастычнага. Выкарыстоўваючы бел. летапісы, Б. значную ўвагу аддае Вял. кн. Літ. У 1554 «Хроніка» перакладзена на бел. мову, у 1584 — з бел. на рускую. Напісаў «Жыццёпісы філосафаў» (1535), «Камедыю Юстына і Канстанцыі» (1557), паліт. сатыру «Майскі сон» (1586), «Гутарку новых прарокаў» (1587) і інш. Абарона інтарэсаў польск. шляхты і заклік слав. народаў да саюзу ў барацьбе з Турэцкай імперыяй — асн. ідэі твораў Б.

Літ.: Голенищев-Кутузов И. Н. Итальянское Возрождение и славянские литературы XV—XVI веков, М., 1963, с. 264—266; Krzyżanowski J. Historia literatury Polskiej, Warszawa, 1964, с. 114—117.

БЕЛЬТ ВЯЛІКІ І МАЛЫ (дацк. Store Bælt, Lille Bælt), назва двух дацкіх праліваў на ПнЗ Еўропы. Злучаюць праліў Катэгат з Балтыйскім м. Б. В.— паміж а-вамі Лолан і Зеландыя на У і Лангелан і Фюн на З. Даўж. каля 120 *км*, найменшая шыр. 11 *км*, глыб. 12—40 *м*. Б. М.— паміж а-вамі Фюн, Эр'ё і п-вам Ютландыя. Даўж. каля 130 *км*, найменшая шыр. 0,6 *км*, глыб. ў паўд. ч. 25—36 *м*, у паўн. 10—15 *м*. У суровыя зімы пралівы замярзаюць.

БЕЛЬЧЫЦЫ, рэзідэнцыя полацкіх князёў у 12 ст. на левым беразе Зах. Дзвіны пры сутоку з р. Бельчанкай, за 2 *км* ад Верхняга замка — крамля стараж. Полацка. У Іпацьеўскім летапісе пад 1159 сказана: «...бяшеть бо князь в то время на Бельщици». Гісторык 16 ст. М. Стрыйкоўскі даводзіць, што Б. былі ўмацаваны вежамі і мураванай сцяной. Часткай гэтай багатай рэзідэнцыі з'яўляліся 4 будынкі Барысаглебскага манастыра (у 17 ст. разбураны Іасафатам Кунцэвічам). Ініцыятарам будаўніцтва аднаго з бельчыцкіх храмаў быў, верагодна, *Барыс Усяславіч*. Паўразбураны будынак і фундаменты 2 пабудоў у 1928 даследаваў І. М. Хозераў. Самы вялікі трохапсідны сабор (20—30-я г. 12 ст., назва невядомая) быў падзелены ўсярэдзіне 6 слупамі на 3 нефы, меў 3 прытворы і плоскія лапаткі на фасадах. Яго падлога выкладзена глазураванымі пліткамі, сцены аздоблены фрэскамі. Другі храм — аднанефавая Пятніцкая ц. (1-я пал. 12 ст., верагодны дойлід Іаан) мела памер (*м*) 5,75×5,75, корабавае скляпенне, прамавугольную апсіду, невялікі прытвор — партэкс; сцены былі распісаны фрэскамі з вывамі князёў Барыса і Глеба. Магчыма, яна была пахавальняй Барыса Усяславіча. Трэці храм — крыжова-купальная шасцістаўповая Барысаглебская ц. (1-я пал. 12 ст.) мела вузкія бакавыя нефы, багаты фрэскавы роспіс, выразны партэкс і своеасаблівы падкупальны пастамент, апрацаваны какошнікамі. На ўсх. баку храма адна апсіда выходзіла за межы плана, а дзве бакавыя былі ў сцяне. Чацвёрты храм — трыконх.



Барысаглебская царква ў Бельчыцах. Паводле А. М. Семянтоўскага.


Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 3, Л.—М., 1966, с. 585; Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966; Сементовский А. М. Белорусские древности, в. 1, СПб., 1890; Штыхов Г. В. Древнеполоцкое каменное зодчество, у кн.: Белорусские древности, Мн., 1967; Воронин Н. Н. Бельчицкие руины, «Архитектурное наследство», 1956, № 6.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

БЕЛЭНЕРГАБУД, будаўніча-мантажны трэст Гал. ўпраўлення па будаўніцтве і мантажы цеплавых эл. станцый Цэнтра і Поўдня СССР Мін-ва энергетыкі і электрыфікацыі СССР. Створаны ў 1958. Асн. задача — буд-ва, мантаж, расшырэнне і рэканструкцыя ЦЭС на Беларусі і ў зах. абласцях РСФСР.







Бельгія. 1. Бругскі канал каля Остэндэ. 2. Намюр. Агульны выгляд. 3. Кафедральны сабор ў Турнэ (канец 12 ст.). 4. Дэманстрацыя работніц ваенных заводаў «Эрсталь». Жанчыны патрабуюць аднолькавай платы за аднолькавую працу з мужчынамі. 5. Брусель. Адміністрацыйная частка горада. 6. А. ван Дэйк. Сямейны партрэт. Каля 1620. 7. П. П. Рубенс. Вакханалія. Каля 1615—20. 8. К. Менье. Грузчык. Бронза. Каля 1905.









А. А. Бембель. Партрэт Героя Савецкага Саюза М. Ф. Гастэлы. 1943. Бронза. Дзярж. мастацкі музей БССР.

Аб'ядноўвае субпадрадныя мантажныя арг-цыі Цэнтрэнергамантаж, Электрацэнтрамантаж, Белэнергацеплаізаляцыя, Гідрараспецбуд, Гідрамеханізацыя і інш.

БЕЛЯВЕЦ Ганна Андрыянаўна (н. 20.7.1920, в. Баранкі Брэсцкага пав. Гродзенскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1960). Чл. КПСС з 1967. З 1950 звенявая па вырошчванні тэхн. культур і кукурузы ў калгасе «Кастрычнік» Камянецкага р-на Брэсцкай вобл., з 1960 старшыня выканкома Відамлянскага сельскага Савета Камянецкага р-на.

БЕЛЯКОЎ Аляксандр Васілевіч (н. 21.12.1897, в. Бязубава Маскоўскай губ.), савецкі ваенны дзеяч. Ген.-л. авіяцыі (1943). Герой Сав. Саюза (1936). Д-р геагр. н., праф. З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1936. Скончыў ваен. вучылішча (1917). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны. У 1930—35 выкладчык Ваен.-паветр. акадэміі імя Жукоўскага, у 1936—39 флаг-штурман далёкалётнай авіяцыі. З В. П. *Чкалавым* і Г. П. *Байдукоевым* удзельнічаў у беспасадачных пералётах Масква — востраў Уд (Чкалаў) (1936) і Масква — Портленд (ЗША) цераз Паўн. полюс (1937). З 1940 нам. начальніка Ваен.-паветр. акадэміі, потым нач. Выш. школы штурманаў; у 1945—60 нач. факультэта Ваен.-паветр. акадэміі. Аўтар прац па аэранавігацыі.

Тв.: Из Москвы в Америку через Северный полюс, [М.], 1938; Два перелета, М., 1939.


БЕЛЯЛЮБСКІ Мікалай Апалонавіч [1(13).3.1845—4.8.1922], рускі інжынер і вучоны ў галіне будаўнічай механікі і мостабудавання. У 1867 скончыў Пецярбургскі ін-т інжынераў шляхоў зносін, з 1873 праф. гэтага ін-та і кіраўнік 1-й у Расіі лабараторыі па выпрабаванні матэрыялаў. Па праектах Б. пабудаваны чыг. і шашэйныя масты і тунелі; сярод іх масты цераз Волгу (Сызранскі, Свіяжскі), Дняпро, Об, Інгулец і інш. Прапанаваў шэраг канструкцый маставых фермаў; распрацаваў т. зв. рускі тып прымацавання папярочных бэлек; укараніў у буд-ва рускія цэменты. У 1885 надрукаваў «Будаўнічую механіку» — першы поўны курс на рус. мове па гэтай дысцыпліне.

Літ.: Прокофьев И. П. Николай Аполлонович Белелюбский, у кн.: Люди русской науки. Очерки о выдающихся деятелях естествознания и техники. Техника, под ред. И. В. Кузнецова, М., 1965.

БЕЛЯШЭЎСКІ Мікалай Фядотавіч [30.9(12.10).1867, Умань Кіеўскай губ.— 21.4.1926], украінскі савецкі археолаг, этнограф і мастацтвазнавец. Акад. АН УССР (1919). Скончыў юрыд. ф-т Кіеўскага ун-та. Рэдактар зб. «Археологическая летопись Южной России» (т. 1—3, Кіеў, 1899—1901) і часопіса той жа назвы (1903—05). Адзін з першых даследчыкаў (90-я г. 19 ст.) паселішчаў на Зах. Бугу і Гомельшчыне, а таксама ў Сярэд. Падняпроўі. У 1902—23 дырэктар Кіеўскага гістар. музея. Аўтар многіх прац па археалогіі і арнаментыцы Украіны.

Тв.: Несколько новых стоянок каменного века по Днепру и его притокам, «Киевская старина», 1891, т. 32, № 3 (март); Дюнные стоянки неолитической эпохи на берегах р. Западного Буга в среднем его течении, у кн.: Труды одиннадцатого Археологического съезда в Киеве. 1899, т. 1, М., 1901.

БЕМБЕЛЬ АндрэйАнуфрыевіч [н. 17(30).10.1905, Веліж Віцебскай губ.], беларускі савецкі скульптар, педагог. Нар. мастак БССР (1955). Праф. (1955). Чл. КПСС з 1952. Вучыўся ў Веліжскай маст. школе, Віцебскім маст. тэхнікуме (1924—27) у М. Керзіна, у Ленінградскай акадэміі маст. (1927—31) у М. Манізера, У. Лішава, В. Сімонава, Р. Баха. Працуе ў Мінску з 1931. Вядомы работамі ў галіне партрэта і манумент. скульптуры. Яго творчасці ўласцівыя аналізальнасць, імкненне да абагульнення, сімвалічнай значнасці вобраза, жаданне падкрэсліць у чалавеку гераічны, валявы пачатак. Першая манумент. работа (з У. Рытарам) — рэльефы кулуараў (1932—34, «Ліпеньскія барыкады ў Парыжы ў 1848», «Парыжская камуна», «Каланіяльныя народы ўзнімаюцца на барацьбу», «Рэвалюцыйны Кітай» і інш.) і залы з'ездаў (1934—35, «СССР — індустрыяльная дзяржава») Дома ўрада ў Мінску. У 1935—36 стварае рэльефы залаў Прэзідыума Вярх. Савета БССР (не вбегарліся) і Акруговага дома афіцэраў. Для павільёна БССР на ВДНГ — рэльеф «Беларусь — фарпост СССР» (1939). Па яго праектах пастаўлены помнікі У. І. Леніну ў Полацку (1936) і Слуцку (1938, абодва знішчаны ў Вял. Айч. вайну). З 1941 у радах Сав. Арміі, у 1943—45 у Бел. штабе партыз. руху. У гэты час мастак стварае самы значны свой твор — партрэт Героя Сав. Саюза М. Ф. Гастэлы (бронза, 1943); барэльеф «Беларускія партызаны», партрэт партыз. кіраўніка П. З. Калініна (абодва 1944) і інш. У пасляваенны час ім зроблены рэльефы:



А. А. Бембель. Беларусь сацыялістычная. Павільён БССР на ВДНГ. 1950—51 (злева). Курган Славы ў гонар Савецкай Арміі.

«У. І. Леніна» (1947, у будынку ЦК КПБ), «9 мая 1945 года» (1954) для мінскага абеліска-помніка воінам Сав. Арміі і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Аўтар партрэтаў А. М. Матросава (1948), П. С. Малачанава (1954), С. І. Ліпранцэніча, І. В. Пісарчанава (абодва 1955). Стварыў помнікі У. І. Леніну (абодва 1948, Дзяржінск, б-ка ЦСКР), Дз. І. Мендзялееву (1952, перад будынкам хім. ф-та Маскоўскага ун-та), Горкаму Сав. Саюза Дз. Ц. Гуляеву (1965, Старобін), а таксама алегарычныя статуі «Беларусь сацыялістычная» (павільён БССР на ВДНГ, 1950—51, цэмент, смальта, выш. 6 *м*) і «Няхай ніколі не будзе ўзняты меч!» (1961). Удзельнічаў у стварэнні Кургана Славы ў гонар Савецкай Арміі (помнік на 21-м *км* Маск. шашы, 1969, в архітэктарам Л. Стаховічам, скульптарам А. Арцымовічам) і помніка абаронцам Брэсцкай крэпасці. Старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР (1950—54). У 1945—50 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы, в 1953 — у Вол. тэатр.-маст. ін-це (в 1957 заг. кафедры скульптуры). Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі. Ім. гл. на ўкл. і ў арт. *Барэльеф*.

Літ.: Орлова М. Андрей Онуфриевич Бембель. М., 1958. *О. А. Петерсан.* Мінск.

ВЕМОЛЬ (франц. bémol), знак *альтэрацыі*.

ВЕНГАЛУРУ (Бангалур), горад на Пд Індыі, адм. ц. штата Майсур. 1680 тыс. ж. (1968). Гандлёва-транспартны вузел, буйны прамысловы, навуковы і культ. цэнтр краіны. У гады незалежнасці (пасля 1947) у В. пабудаваны буйныя дзярж. прадпрыемствы: заводы авіяцыйны, станкабудаўнічы, тэлефонна-апаратурны і электроннага абсталявання. Вагонабудаванне. Тэкстыльныя (баваўнянныя, шаўковыя, шарсцяныя, штучныя) ф-кі, саматужная мастацкая вытворчасць дываноў. Харчовыя, керамічныя, абутковыя, мыларварныя, фармацэўтычныя прадпрыемствы. Кінастудыя. Ун-т (з 1916), інш. ВНУ, н.-д. ін-ты і лабараторыі. Мастацкая галерэя. Батанічны сад.

ВЕНГАЛЬСКАЯ РАЎНІНА, на нізінным цэнтр. ч. Ганга і Брахмапутры. 100 *м* над узр. м. Вобласць нядаўняга апускання, запоўненая рачнымі наносамі. Клімат тропічны, мусонны. Ападкаў да 2000 *мм* за год. У даліне Ганга-Брахмапутры вільготныя трапічныя лясы, у пасуш. частках мангравыя расліннасць. Вырошчваюцца рыс, джут, чай, садавіна і агародніна.

ВЕНГАЛЬСКІ ЗАЛІЎ, частка Індыйскага ак. паміж п-вам Індастан і в-вам Цэйлон на З, п-вам Індакітай і а-вамі Андаманскімі і Нікабарскімі на У. Пл. 2172 тыс. *км*². Глыб. да 4206 *м*. Т-ра вады на паверхні 25—27 °С (люты), 28 °С (жнівень). Салёнасць ад 34‰ і менш, паблізу ад вусця Ганга да 30‰. У В. ў. упадаюць рэкі: Ганг, Брахмапутра, Маханады, Годавары, Крышна. Прыліны паўсутачныя, выш. да 10,7 *м*. Лоўля макрэлі, скумбрыі, трэпанга. Гал. парты: Калькута, Мадарас (Індыя), Чатагам (Пакістан).

ВЕНЕК Казімір Францавіч (24.1(5.2).1895, в. Радзівонічы Велюньскага пав. Калішскай губ.— 1937], дзяржаўны дзеяч БССР. Чл. КПСС з сак. 1917. З сям'і парабка. У рэвалюц. рух уключыўся ў 1912. У 1914 арыштаваны і вывезены ў Модлінскай крэпасці, адтуль уцёк. Працаваў на з-дах Крывога Рога, Екацярынаслава і Каменска. Пасля Лют. рэв. ў Каменску: чл. і сакратар гар. Савета, камісар па польскіх справах, чл. гар. думы (на спісе бальшавікоў). Удзельнік Кастр. рэвалюцыі ў Маскве. У нач. 1918 у чырвонагвардзейскім атрадзе змагаўся з ням. войскамі, быў губ. камісарам па польскіх справах у Варонежы. З канца 1918 камісар камандных курсаў Зах. стралковай дывізіі, нам. начальніка палітаддзела 8-й дывізіі, інструктар палітаддзела 16-й арміі. У 1920—24 сакратар Магілёўскага навітовага к-та партыі, заг. аддзела Гомельскага губвыканкома, сакратар Барысаўскага навітовага к-та КП(б)В. У 1924—27 чл. калегіі НК РСІ БССР і чл. Прэзідыума ЦКК КП(б)В, нам. наркома РСІ БССР, у 1927—29 нарком працы БССР, у 1929—30 нарком гандлю БССР, у 1930—34 нам. старшыні СНК БССР, у 1933—37 нарком земляробства БССР. Чл. ЦВК БССР (1924—37) і ЦВК СССР (1931—37), чл. ЦК КП(б)В.


М. І. Каміскі. Мінск.

ВЕНЕФІЦЫЙ (лац. beneficium літар. дабрадзейства), 1) у Старажытным Рыме прывілеі, ільготы, надаванні імператараў і г. д. 2) У перыяд ранняга сярэдневякоўя ў Зах. Еўропе зямельнае надаванне караля ці буйнога феадала на пажыццёвае карыстанне спайму васалу за ваен. ці адм. службу. Пасля смерці трымальніка В. пераходзіў яго нашчадкам або вяртаўся ўладальніку. З развіццём феад. адносін (9—11 ст.) В. ператварыўся ў спадчыннае трыманне — *феод*. У Расіі В. адпавядаў маёнтак, у Візантыі — *проній*, у арабскіх краінах — *ікта*, у Індыі — джагір. 3) У каталіцкай царкве — царк. пасада і ўзнагарода ў бю даход.

Літ.: Энгельс Ф. Франкский период. Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 19.

ВЕНЕШ (Beneš) Эдуард (28.5.1884, Кожляны — 3.9.1948), чэхаславацкі дзярж. дзеяч і дыпламат. У 1918—35 міністр замежных спраў, 1921—22 кіраўнік урада, 1935—38 прэзідэнт Чэхаславакіі. Прыхільнік блізкага супрацоўніцтва з Францыяй, актыўны дзеяч *Антанты Малой*. Пасля прыходу фашыстаў да ўлады ў Германіі найноў на збліжэнне з СССР, аднак быў непасрэдоўны: у 1938 адмовіўся ад прапанаванай сав. урадам дапамогі для барацьбы супраць фаш. агрэсіі, прыняў умовы *Мюнхенскага пагаднення 1938* пра падзел Чэхаславакіі. У кастр. 1938 выехаў у ЗША, потым у Англію. У 1940 у Лондане стварыў эмігранцкі Нац. савет, які ў 1941 даручыў антыгітлераўскай кааліцыі прызнаці яго ўрад Чэхаславакіі. У снеж. 1943 наведаў Маскву, дзе падпісаў сав.-чэхаславацкі дагавор аб дружбе, узаемадапамозе і пасляваен. супрацоўніцтве. Пасля вызвалення Чэхаславакіі В. зноў быў выбраны (чэрв. 1946) прэзідэнтам. У лют. 1948 падтрымаў кіраўніцтва спробу рэакцыі ажыццявіць контрэвалюцыйны пераварот. У чэрв. 1948 падаў у адстаўку прэзідэнцкую пасаду.

ВЕНЗАРАЗДАТАЧНАЯ КАЛОНКА, помпавая ўстаноўка для раздачы бензіну і інш. відаў вадкага аўтамабільнага паліва. Ставіцца на *аўтазаправачных станцыях* (АЗС) і злучаюцца трубаправодам з паліўнымі рэзервуарамі.



Вензаразда-тачная калонка.

В. к. абсталявана прымальным патрубкам *(1)*; помпай *(2)*, якая прыводзіцца ў дзеянне электрарухавіком *(3)*; газаадлучнікам *(7)*; фільтрам *(8)*; лічыльным прыстасаваннем падачы паліва *(6)*; шлангам *(4)* з раздатачным пісталетам *(5)*. Лічыльнае прыстасаванне мае датчык дыстанцыйнага кіравання калонкай з пульта, які знаходзіцца ў памяшканні АЗС. Падача паліва спыняецца аўтаматычна.

ВЕНЗАРЭЗ, апарат для кіслародна-рэзкі металаў, які працуе на вадкім паліве (бензін, газа). Мае бак для паліва, гарэлку спец. канструкцыі (рэзак) і шлангі падачы паліва



Вензарэз: *1* — рэзак; *2* — бак для паліва; *3* — шлангі падачы паліва і кіслароду.

і кіслароду. Паліва з бака да рэзака падаецца праз шланг з гумы (дзюрыту) ручной насцярэтанай помпай, умантаванай у бак. У рэзаку паліва выпарваецца і змешваецца з кіслародам. Пры гарэнні сумесі ўтвараецца полымя, якое падагрэе метал і выпарвае паліва ў падагравальніку рэзака. Падагрэты метал рэжуць струменем кіслароду, які падаецца з балона пад ціскам. В. мае нявысокую нажарную небяспеку, але дакументы перавозіць (выкарыстанне вадкага паліва, падзеньваенне працэсу рэзкі металаў і інш.) шырока ўжываецца ў вытворчасці.

ВЕНЗІН (франц. benzine), складаная сумесь вуглевадародаў, якая кіпіць у межах ад 40—205 °С. Як прымесі ў В. заўсёды прысутнічаюць кіслародна-, серна- і азотамяшчальныя арганічныя злучэнні. Чысты В.— бясколерная лятучая вадкасць з спецыфічным пахам, шчыльн. 700—780 *кг/м*³, замярзае пры т-рах ніжэй за —60 °С. Каля 90% В. атрымліваюць з нафты і нафтавых спадарожных газаў прамой перагонкай, крэкінгам і рыформінгам, а сінтэтычны В.— з вугалю, сланцу і з сумесі вокісу вугляроду з вадародам. Выкарыстоўваюць В. як маторнае паліва ў рухавіках унутр. згарання з іскравым запальваннем і як растваральнікі і экстрагенты.

Найважнейшыя характарыстыкі маторных В.: актанавы лік (АЛ) (гл. *Актан*) — вызначае антыдэтанацыйныя ўласцівасці паліва (гл. *Дэтанацыя*), г. зн. устойлівасць работы рухавіка на розных рэжымах; фракцыйны састаў — вызначае лёгкасць пуску рухавіка. АЛ залежыць ад прыроды і будовы вуглевадародаў, што ўваходзяць у састаў В. Каб павысіць яго, у В. дадаюць тэтраэтылсвінец (ТЭС) ад 0,4 да 3,3 *г/кг*. ТЭС вельмі ядавіты, таму В. з ім мецяць: розным маркі ў розны колер. Маркіруюцца В. паводле свайго прызначэння і АЛ, напр. аўтамабільныя А-66, А-72, «экстра» (АІ-98), авіяцыйныя — (Б-91/115). Аўтамабільныя В. розных гатункаў маюць розныя ўласцівасці, авіяцыйныя адрозніваюцца толькі дэтанацыйнай стойкасцю.

В. як растваральнікі і экстрагенты павінны быць лятучыя і малатаксічныя. Гэта вузкія фракцыі сумесей вуглевадародаў з нізкай т-рай кіпення і найніжэйшай колькасцю арамат. вуглевадародаў. Атрымліваюць іх прамой перагонкай нафты. Для гумавай прамысл. выпускаюць В. марак БР-1 і БР-2 з *t* кіп. 80—120 °С; для лакафарбавай (уайт-спірыт) з *t* кіп. 165—200 °С, для экстракцыйных мэт В. з *t* кіп. 70—100 °С. Пара В. ядавітая, а пры вялікай канцэнтрацыі з паветрам утвараюць выбуховыя сумесі.

Літ.: Польшаков Г. Ф., Гулин Е. И. и Торичнев Н. Н. Физико-химические основы применения моторных, реактивных и ракетных топлив, М.—Л., 1965; Забрянский Е. И. и Зарубин А. Н. Детонационная стойкость и воспламеняемость моторных топлив, 2 изд., М.—Л., 1965.

І. Ф. Асіпенка. Мінск.

ВЕНЗОЙНАЯ КІСЛАТА, C_6H_5COOH, найпрасцейшая адпаасноўная кіслата араматычнага раду. Крышталічнае рэчыва без колеру і паху, *t* пл. 122,4 °С, *t* кіп. 249 °С; шчыльн. 1270 *кг/м*³, добра растваральная ў эфіры, спірце і хлараформе, слаба — у вадзе. Хім. ўласцівасцямі нагадвае карбонавыя кіслоты: з асновамі ўтварае солі, са спіртамі — складаныя эфіры. У прыродзе злучэнні В. к. бываюць у смолах, бальзамах і эфірных алеях. У прамысл. атрымліваюць акісленнем талуолу або з фталевай к-ты. В. к., яе солі і эфіры ўжываюць як антысептыкі і кансерванты ў медыцыне і ў харч. прамысловасці, а таксама ў вытв. фарбавальнікаў і інш. арган. рэчываў.

ВЕНЗОЛ, C_6H_6, найпрасцейшы з *араматычных вуглевадародаў*. Упершыню выдзелены з свяцільнага газу ў 1825 англ. фізікам М. Фарадэем. Бясколерная, лятучая, рухомая, вогненебяспечная вадкасць з спецыфічным пахам, *t* пл. 5,5 °С, *t* кіп. 80,1 °С; шчыльнасць 879 *кг/м*³, з паветрам пара В. ўтварае выбуховыя сумесі (1,5—5% В.).

В. змешваецца ў любых адносінах з большасцю арган. растваральнікаў, але вельмі слаба растваральная ў вадзе, растварае тлушчы, каўчук, смолы, а таксама фосфар, серу і ёд. З многімі злучэннямі утварае падвойныя і патройныя азеатропныя сумесі. Устойлівы да дзеяння акіслальнікаў, лёгка

«У. І. Ленін» (1947, у будынку ЦК КПБ), «9 мая 1945 года» (1954) для мінскага абеліска-помніка воінам Сав. Арміі і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Аўтар партрэтаў А. М. Матросава (1948), П. С. Малчанава (1954), С. І. Ляпранцэвіча, І. В. Пісарчыка (абодва 1955). Стварыў помнікі У. І. Леніну (1948, Дзяржаўны б-ка БССР), Дз. І. Менделееву (1952, перад будынкам хім. ф-та Маскоўскага ун-та), Герою Сав. Саюза Дз. Ц. Гуляеву (1965, Старобін), а таксама алегарычныя статуі «Беларусь сацыялістычная» (павільён БССР на ВДНГ, 1950—51, цэмент, смальта, выш. 6 *м*) і «Няхай ніколі не будзе ўзняты меч!» (1961). Удзельнічаў у стварэнні Кургана Славы ў гонар Савецкай Арміі (помнік на 21-м *км* Маск. шашы, 1969, з арх. А. Стаховічам, скульптарам А. Арцымовічам) і помніка абаронцам Брэсцкай крэпасці. Старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР (1950—54). У 1945—50 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы, з 1953 — у Бел. тэатр.-маст. ін-це (з 1957 заг. кафедры скульптуры). Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі. Іл. гл. на ўкл. і ў арт. *Барэльеф*.

Літ.: Орлова М. Андрей Онуфриевич Бембель, М., 1958. *Э. А. Петэрсан.* Мінск.

БЕМОЛЬ (франц. bémol), знак *альтэрацыі*.

БЕНГАЛУРУ (Бангалур), горад на Пд Індыі, адм. ц. штата Майсур. 1680 тыс. ж. (1968). Гандлёва-транспартны вузел, вялікі прамысловы, навуковы і культ. цэнтр краіны. У гады незалежнасці (пасля 1947) у Б. пабудаваны вялікія дзярж. прадпрыемствы: заводы авіяцыйны, станкабудаўнічы, тэлефонная апаратуры і электроннага абсталявання. Вагонабудаванне. Тэкстыльныя (баваўняная, шарсцяная, шаўковыя) ф-кі, саматужная вытворчасць дываноў. Харчовыя, керамічныя, абутковыя, мылаварныя, фармацэўтычныя прадпрыемствы. Кінастудыя. Ун-т (з 1916), інш. ВНУ, н.-д. ін-ты і лабараторыі. Мастацкая галерэя. Батанічны сад.

БЕНГАЛЬСКАЯ РАЎНІНА, па ніжнім цячэнні рэк Ганга і Брахмапутры. 100 *м* над узр. ак. Вобласць нядаўняга апускання, запоўненая рачнымі наносамі. Клімат трапічны, мусонны. Ападкаў да 2000 *мм* за год. У даліне Ганга-Брахмапутры вільготныя трапічныя лясы, у паўд. частцы мангравая расліннасць. Вырошчваюцца рыс, джут, чай, садавіна і агародніна.

БЕНГАЛЬСКІ ЗАЛІЎ, частка Індыйскага ак. паміж п-вам Індастан і в-вам Цэйлон на З, п-вам Індакітай і а-вамі Андаманскімі і Нікабарскімі на У. Пл. 2172 тыс. км². Глыб. да 4206 *м*. Т-ра вады на паверхні 25—27 °С (лютым), 28 °С (жнівень). Салёнасць ад 34‰ і менш, паблізу ад вусця Ганга да 30‰. У Б. з. упадаюць рэкі: Ганг, Брахмапутра, Маханады, Гадавары, Крышна. Прылівы паўсутачныя, выш. да 10,7 *м*. Лоўля макрэлі, скумбрыі, трэпанга. Гал. порты: Калькута, Мадарас (Індыя), Чатагам (Пакістан).

БЕНЕК Казімір Францавіч [24.1(5.2).1895, в. Радашавічы Велюньскага пав. Калішскай губ.— 1937], дзяржаўны дзеяч БССР. Чл. КПСС з сак. 1917. З сям'і парабка. У рэвалюц. рух уключыўся ў 1912. У 1914 арыштаваны і прызваны ў Модлінскай крэпасці, адтуль уцёк. Працаваў на з-дах Крывога Рога, Екацярынаслава і Каменска. Пасля Лют. рэв. ў Каменску: чл. і сакратар гар. Савета, камісар па польскіх справах, чл. гар. думы (па спісе бальшавікоў). Удзельнік Кастр. рэвалюцыі ў Маскве. У пач. 1918 у чырвонагвардзейскім атрадзе змагаўся з нім. войскамі, быў губ. камісарам па польскіх справах у Варонежы. З канца 1918 камісар камандных курсаў Зах. стралковай дывізіі, нам. начальніка палітаддзела 8-й дывізіі, інструктар палітаддзела 16-й арміі. У 1920—24 сакратар Магілёўскага павятовага к-та партыі, заг. аддзела Гомельскага губвыканкома, сакратар Барысаўскага павятовага к-та КП(б)Б. У 1924—27 чл. калегіі НК РСІ БССР і чл. Прэзідыума ЦКК КП(б)Б, нам. наркома РСІ БССР, у 1927—29 нарком працы БССР, у 1929—30 нарком гандлю БССР, у 1930—34 нам. старшыні СНК БССР, у 1933—37 нарком земляробства БССР. Чл. ЦВК БССР (1924—37) і ЦВК СССР (1931—37), чл. ЦК КП(б)Б.


М. І. Каміскі. Мінск.

БЕНЕФІЦЫЙ (лац. beneficium літар. дабрадзейства), 1) у Старажытным Рыме прывілеі, ільготы, падараванні імператараў і г. д. 2) У перыяд ранняга сярэдневякоўя ў Зах. Еўропе зямельнае падараванне караля ці буйнога феадала на пажыццёвае карыстанне свайму васалу за ваен. ці адм. службу. Пасля смерці трымальніка Б. перадаваўся яго следнікам або вяртаўся ўладальніку. З развіццём феад. адносін (9—11 ст.) Б. ператварыўся ў спадчыннае трыманне — *феод*. У Расіі Б. адпавядаў маёнтак, у Візантыі — *проній*, у арабскіх краінах — *ікта*, у Індыі — джагір. 3) У каталіцкай царкве — царк. пасада і звязаны з ёю даход.

Літ.: Энгельс Ф. Франкский период. Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 19.

БЕНЕШ (Beneš) Эдуард (28.5.1884, Кожляны — 3.9.1948), чэхаславацкі дзярж. дзеяч і дыпламат. У 1918—35 міністр замежных спраў, 1921—22 кіраўнік урада, 1935—38 прэзідэнт Чэхаславакіі. Прыхільнік блізкага супрацоўніцтва з Францыяй, актыўны дзеяч *Антанты Малой*. Пасля прыходу фашыстаў да ўлады ў Германіі пайшоў на збліжэнне з СССР, аднак быў непаслядоўны: у 1938 адмовіўся ад прапанаванай сав. урадам дапамогі для барацьбы супраць фаш. агрэсіі, прыняў умовы *Мюнхенскага пагаднення 1938* пра падзел Чэхаславакіі. У кастр. 1938 выехаў у ЗША, потым у Англію. У 1940 у Лондане стварыў эмігранцкі Нац. савет, які ў 1941 дзяржавы антыгітлер. кааліцыі прызналі як урад Чэхаславакіі. У снеж. 1943 наведаў Маскву, дзе падпісаў сав.-чэхаславацкі дагавор аб дружбе, узаемадапамозе і паслявае. супрацоўніцтве. Пасля вызвалення Чэхаславакіі Б. зноў быў выбраны (чэрв. 1946) прэзідэнтам. У лют. 1948 падтрымаў няўдалую спробу рэакцыі ажыццявіць контррэвалюц. пераварот. У чэрв. 1948 пакінуў прэзідэнцкую пасаду.


БЕНЗАРАЗДАТАЧНАЯ КАЛОНКА, помпавая ўстаноўка для раздачы бензіну і інш. відаў вадкага аўтамабільнага паліва. Ставяцца на *аўтазаправачных станцыях* (АЗС) і злучаюцца трубаправодам з паліўнымі рэзервуарамі.



Бензараздатачная калонка.

Б. к. абсталявана прымальным патрубкам *(1)*; помпай *(2)*, якая прыводзіцца ў дзеянне электрарухавіком *(3)*; газаадлучнікам *(7)*; фільтрам *(8)*; лічыльным прыстасаваннем падачы паліва *(6)*; шлангам *(4)* з раздатачным пісталетам *(5)*. Лічыльнае прыстасаванне мае датчык дыстанцыйнага кіравання калонкай з пульта, які знаходзіцца ў памяшканні АЗС. Падача паліва спыняецца аўтаматычна.

БЕНЗАРЭЗ, апарат для кіслароднай рэзкі металаў, які працуе на вадкім паліве (бензін, газа). Мае бак для паліва, гарэлку спец. канструкцыі (разак) і шлангі падачы паліва і кіслароду. Паліва з бака да разака падаецца праз шланг з гумы (дзюрыту) ручной паветранай помпай, уманціраванай у бак. У разаку паліва выпарваецца і змешваецца з кіслародам. Пры гарэнні сумесі ўтвараецца полымя, якое падагравае метал і выпарвае паліва ў падагравальніку разака. Падагрэты метал рэжуць струменем кіслароду, які падаецца з балона пад ціскам. Б. мае павышаную пажарную небяспеку, але дзякуючы шэрагу пераваг (выкарыстанне вадкага паліва, падзешаўленне працэсу рэзкі металаў і інш.) шырока ўжываецца ў вытворчасці.



Бензарэз: *1* — разак; *2* — бак для паліва; *3* — шлангі падачы паліва і кіслароду.

БЕНЗІН (франц. benzine), складаная сумесь вуглевадародаў, якая кіпіць у межах т-р 40—205 °С. Як прымесі ў Б. заўсёды прысутнічаюць кіслародн-, сера- і азотамяшчальныя арган. злучэнні. Чысты Б.— бясколерная лятучая вадкасць з спецыфічным пахам, шчыльн. 700—780 *кг/м*³, замярзае пры т-рах ніжэй за —60 °С. Каля 90% Б. атрымліваюць з нафты і нафтавых спадарожных газаў прамой перагонкай, крэкінгам і рыформінгам, а сінтэтычны Б.— з вугалю, сланцу і з сумесі вокісу вугляроду з вадародам. Выкарыстоўваюць Б. як маторнае паліва ў рухавіках унутр. згарання з іскравым запальваннем і як растваральнікі і экстрагенты.

Найважнейшыя характарыстыкі маторных Б.: антанавы лік (АЛ) (гл. *Ізаактан*) — вызначае антыдэтанацыйныя ўласцівасці паліва (гл. *Дэтанацыя*), г. зн. устойлівасць работы рухавіка на розных рэжымах; фракцыйны састаў — вызначае лёгкасць пуску рухавіка. АЛ залежыць ад прыроды і будовы вуглевадародаў, што ўваходзяць у састаў Б. Каб павысіць яго, у Б. дадаюць тэтраэтылсвінец (ТЭС) ад 0,4 да 3,3 *г/кг*. ТЭС вельмі ядавіты, таму Б. з ім мепяць: розныя маркі ў розны колер. Маркіруюцца Б. паводле свайго прызначэння і АЛ, напр. аўтамабільныя А-66, А-72, «экстра» (АЛ-98), авіяцыйныя — (Б-91/115). Аўтамабільныя Б. розных гатункаў маюць розныя ўласцівасці, авіяцыйныя адрозніваюцца толькі дэтанацыйнай стойкасцю.

Б. як растваральнікі і экстрагенты павінны быць лятучыя і малатаксічныя. Гэта вузкія фракцыі сумесей вуглевадародаў з нізкай т-рай кіпення і паніжанай колькасцю араматычных вуглевадародаў. Атрымліваюць іх прамой перагонкай нафты. Для гумавай прамысл. выпускаюцца Б. марак БР-1 і БР-2 з *t* кіп. 80—120 °С; для лакафарбавай (уайт-спірыт) з *t* кіп. 165—200 °С, для экстракцыйных мэт Б. з *t* кіп. 70—100 °С. Пара Б. ядавітая, а пры пэўнай канцэнтрацыі з паветрам утварае выбуховыя сумесі.

Літ.: Большаков Г. Ф., Гулин Е. И. и Торичнев Н. Н. Физико-химические основы применения моторных, реактивных и ракетных топлив, М.—Л., 1965; Забрянский Е. И. и Зарубин А. П. Детонационная стойкость и воспламеняемость моторных топлив, 2 изд., М.— Л., 1965.

І. Ф. Асіпенка. Мінск.

БЕНЗОЙНАЯ КІСЛАТА, C_6H_5COOH, найпрасцейшая аднаасноўная кіслата араматычнага раду. Крышталічнае рэчыва без колеру і паху, *t* пл. 122,4 °С, *t* кіп. 249 °С; шчыльн. 1270 *кг/м*³, добра растваральная ў эфіры, спірце і хлараформе, слаба — у вадзе. Хім. ўласцівасцямі нагадвае карбонавыя кіслоты: з асновамі ўтварае солі, са спіртамі — складаныя эфіры. У прыродзе злучэнні Б. к. бываюць у смолах, бальзамах і эфірных алеях. У прамысл. атрымліваюць акісленнем талуолу або з фталевай к-ты. Б. к., яе солі і эфіры ўжываюць як антысептыкі і кансерванты ў медыцыне і ў харч. прамысловасці, а таксама ў вытв. фарбавальнікаў і інш. арган. рэчываў.

БЕНЗОЛ, C_6H_6, найпрасцейшы з *араматычных вуглевадародаў*. Упершыню выдзелены з свяцільнага газу ў 1825 англ. фізікам М. Фарадэем. Бясколерная, лятучая, рухомая, вогненебяспечная вадкасць з спецыфічным пахам, *t* пл. 5,5 °С, *t* кіп. 80,1 °С; шчыльнасць 879 *кг/м*³. З паветрам пара Б. ўтварае выбуховыя сумесі (1,5—5% Б.).

Б. змешваецца ў любых адносінах з большасцю арган. растваральнікаў, але вельмі слаба раствараецца ў вадзе, растварае тлушчы, каўчук, смолы, а таксама фосфар, серу і ёд. З многімі злучэннямі ўтварае падвойныя і патройныя азеатропныя сумесі. Устойлівы да дзеяння акіслальнікаў, лёгка

ўступае ў рэакцыі электрафільнага замяшчэння: нітравання, сульфавання, галагенавання, у выніку гэтага ўтвараюцца многія напаўпрадукты хім. прамысловасці.

Атрымліваюць Б. з коксавага газу і з нафты (гл. *Араматызацыя нафтапрадуктаў*). Выкарыстоўваюць у вытв. фарбавальнікаў, фармацэўтычных прэпаратаў, пластмас, штучных валокнаў, як кампанент, што павышае актанавы лік маторнага паліва, як растваральнік і экстрагавальны сродак у вытв. лакаў і фарбаў. Пара Б. шкодна дзейнічае на арганізм чалавека, вадкі Б. раз'ядае скуру.

Літ.: Ворожцов Н. Н. Основы синтеза промежуточных продуктов и красителей, 4 изд., М., 1955; Ингольд К. К. Механизм реакций и строение органических соединений, пер. с англ., М., 1959. *І. І. Чыжэўская.*

БЕНІГСЕН Лявонцій Лявонцьевіч (10.2.1745, Гановер — 2.10.1826), ваенны дзеяч, генерал ад кавалерыі рускай арміі. У 1773 з гановерскай арміі перайшоў на службу ў рус. армію. Удзельнік паходаў супраць Турцыі (1774, 1788, 1789, 1790), вызначыўся пры асадзе Ачакава, Дэрбента, душыў паўстанні Е. І. Пугачова і Т. Касцюшкі. У 1792 пад Мірам, Слонімам, Ваўкавыскам, Нясвіжам, Зэльвам ваяваў супраць войск Вял. кн. Літ. Удзельнік забойства імператара Паўла I у час дварцовага перавароту. У 1801—06 ак. літоўскі ваен. губернатар кіраваў Віленскай і Гродзенскай губ. У 1806—07 як камандзір корпуса і галоўнакамандуючы рус. арміі ўдзельнічаў у баях супраць Напалеона; у час Айч. вайны 1812 за процідзеянне М. І. Кутузаву зняты з пасады нач. Галоўнага штаба. У загранічных паходах 1813—14 камандуючы рэзервовай арміі. У 1818 звольнены са службы, вярнуўся ў Гановер, там і памёр.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Беннигсен, Соч., т. 14.

БЕНІЛЮКС, таможна-эканамічны саюз Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембурга. Афарміўся ў 1943—44 як таможны саюз, з 1958 ператвораны ў таможна-эканамічны. Вышэйшы орган Б.— Камітэт міністраў, у які ўваходзіць па адным прадстаўніку ад кожнай краіны. Ген. сакратарыят у Бруселі. Краіны Б. былі ў ліку арганізатараў ваенна-паліт. групоўкі зах. дзяржаў — *Брусельскага пакта* (1948), у 1958 уступілі ў *Еўрапейскае эканамічнае таварыства*, з'яўляюцца ўдзельнікамі *Заходнееўрапейскага саюза* і агрэс. ваеннага блока НАТО — *Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавору*.

БЕНІНА МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРА, мастацкая культура дзяржавы Бенін, заснаванай народам біні. Дзяржава існавала на тэр. Паўднёвай Нігерыі да 19 ст.; разгромлена англ. каланізатарамі ў 1897. Як мяркуюць, маст. культура Беніна — адгалінаванне больш старадаўняй культуры іоруба. Росквіт яе адносіцца да 15—17 ст. У той час высокага ўзроўню дасягнула разьба па слановай косці і ліццё з бронзы.

Раннія ўзоры (да канца 16 ст.) звязаны з традыцыямі мастацтва іарубанскага горада-дзяржавы Іфе. Адлітыя з бронзы галовы цара і яго прыдворных, статуэткі вяльможаў, паляўнічых, воінаў, фігуркі звяроў і птушак зроблены ва ўмоўнай манеры, вызначаюцца тонкасцю выканання і мяккасцю фактуры. Скульптура позняга часу (бронзавыя дошкі з пакаэам прыдворных і бытавых сцэн) схематычная і ўмоўная. Вельмі тонка зроблены са слановай косці маскі-падвескі, кубкі, рэльефы на слановых бівнях. Сярод арх. збудаванняў сталіцы «Вялікага Беніна» (была абкружана валам і мела шырокія вуліцы) вызначаўся комплекс царскага палаца, абнесенага высокай сцяной, з шэрагам унутраных двароў, абрамленых галерэямі.





Галава прынцэсы. Ахвярапрынашэнне (рэльеф). Бронза. Брытанскі музей. Лондан.

Літ.: Ольдерогге Д. А. Искусство народов Западной Африки в музеях СССР, Л.— М., 1958; Мириманов В. Б. Африка. Искусство, М., 1967; Forman W., Forman B. a Dark P. Die Kunst von Benin. Album, Praha, 1960. *Л. М. Сільверсван.* Масква.

БЕНТАЛЬ (англ. benthal ад грэч. bénthos глыбіня), дно вадаёма як асяроддзе жыцця дзейнасці арганізмаў, што жывуць на грунце (*бентас*). Процілеглае Б.— пелагіяль (тоўшча вады).

БЕНТАНІТ (ад назвы г. Форт-Бентан у ЗША), адбельная гліна, якая складаецца пераважна з *мантмарыланіту*. Утвараецца ў выніку падводнай змены вулканічных туфаў і попелу. Прыродны або актывізаваны (апрацаваны кіслатой) Б. мае высокія адсарбцыйныя ўласцівасці. Ужываецца як адсарбент для ачысткі прадуктаў нафтаперапрацоўчай, коксахімічнай і харч. прамысловасці; у фармовачных сумесях у ліцейнай вытв.; як напаўняльнік у папяровай і гумавай прамысл.; у вытв. мінер. мыла — кілу. Радовішчы ў СССР (Украіна, Крым, Закаўказзе і інш.), у Канадзе, Кітаі, Мексіцы, Румыніі, ЗША.

БЕНТАС (грэч. benthos глыбіня), сукупнасць арганізмаў, якія жывуць у грунце і на грунце вадаёмаў. Падзяляецца на расліны (фітабентас) і жывёлы (заабентас).

Фітабентас прэсных вадаёмаў складаецца з бактэрый, водарасцей; заабентас — з прасцейшых, губак, распічных і малашчаціністых чарвей, ракападобных, малюскаў, п'явак, насякомых і інш. Больш разнастайны і багаты марскі Б.: беспазваночныя жывёлы ўсіх тыпаў, ракападобныя, іглакожыя, рыбы, водарасці. Заабентас — рухомыя, маларухомыя і нерухомыя (прымацаваныя) жывёлы. Ёсць драпежнікі, раслінаедныя, дэтрытаедныя і інш. формы. Да марскога фітабентасу належаць пераважна прымацаваныя расліны. Склад Б. залежыць ад глыбіні вадаёма, аддаленасці ад берага, характару дна (пясчанае, камяністае, ілістае) і дазваляе вызначыць тып вадаёма. Забяспечанасць вады прадуктамі разлажэння. Б.— кармавая база для многіх рыб (карпа, ляшча, сазана, ліня ў прэсных вадаёмах, траскі, пікшы — у марскіх). Некаторыя прадстаўнікі Б. ядомыя (мадыскі, ракападобныя, водарасці і інш.) або ідуць на тэхн. патрэбы.

БЕНУА Аляксандр Мікалаевіч [21.4(3.5). 1870, Пецярбург — 9.2.1960], рускі графік, жывапісец, тэатральны мастак, гісторык мастацтва, мастацкі крытык, музейны дзеяч. Ідэйны кіраўнік аб'яднання *«Свет мастацтва»*. Сын акад. архітэктуры М. Бенуа. Скончыў юрыд. ф-т Пецярбургскага ун-та (1894). Жывапісу вучыўся самастойна. Удзельнічаў у выстаўках (з 1893) як пейзажыст і аўтар гістар. кампазіцый, прысвечаных Францыі 17—18 ст. (серыя «Апошнія прагулкі Людовіка XIV», 1897—98; «Версальская серыя», 1905—06), Расіі 18 ст. («Парад у часы Паўла I», 1907). З 1899 выступаў у газетах і часопісах з артыкуламі пра мастацтва. Ініцыятар і маст. кіраўнік «Рускіх сезонаў» у Парыжы. Паставіў (з М. Фокіным) і афарміў балеты «Сільфіды» (1909), «Пятрушка» І. Стравінскага (1911) і інш. У 1913—15 гал. мастак Маскоўскага маст. т-ра, дзе выступаў і як рэжысёр (удзельнічаў у пастаноўцы «Гаспадыні гасцініцы» К. Гальдоні, 1914; «Пушкінскага спектакля», 1915, і інш.). Афармляў творы Пушкіна; найвышэйшае дасягненне — ілюстрацыі да «Меднага конніка» (1903, 1905 і 1916—22). З 1918 заг. карціннай галерэі Эрмітажа; займаўся станковай і кніжнай графікай, супрацоўнічаў як мастак і рэжысёр у б. Марыінскім («Пікавая дама» П. Чайкоўскага, 1921) і Вялікім драм. («Мальераўскі спектакль», 1921) т-рах у Петраградзе. З 1926 жыў у Парыжы. Працаваў у муз. т-рах Еўропы. Пісаў пейзажы, гістар. кампазіцыі на рус. тэмы, рабіў ілюстрацыі.

Тв.: Русская школа живописи, СПб., 1904; История живописи [всех времен и народов], в. 1—22, СПб., 1912—[1917]; Жизнь художника. Воспоминания, т. 1—2, Нью-Йорк, 1955.

Літ.: Эткинд М. Александр Николаевич Бенуа, Л.— М., 1965.

БЕНЮК (Beniuc) Міхай (н. 20.11.1907, в. Себеш-Алба, вобл. Клуж), румынскі паэт. Камуніст. Чл. Рум. АН (1955). З сяляк. Першыя аб. вершаў «Песні пагібелі» (1938), «Новыя песні» (1940), «Згублены горад» (1943), звязаныя з марай рум. сялянства пра зямлю і волю, напісаны ў духу рэвалюц. рамантызму. У аб. «Чалавек чакае ўсходу» (1946), «Яблыня каля дарогі» (1954), «Хлеб» (1956), «Сэрца старога Везувія» (1957), «На струнах часу» (1963), «Дзень за днём» (1965), «Мазаіка» (1968), «Вершы» (1969) аплавае буд-ва сацыялізма ў Румыніі.


Тв.: Рус. пер.— Стихи, М., 1958; Вечное пламя, М., 1961.


БЕНЯДЗІКТАЎ Георгій Міхайлавіч [н. 11(24).11.1916, Саратаў], беларускі савецкі архітэктар. Засл. арх. БССР (1969). У 1943 скончыў Ленінградскі ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна. З 1946 у Мінску. Працаваў ва Упраўленні па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР, у бел. філіяле Саюздзіпрагандлю (1948—54). З 1954 у Белдзяржпраекце. Гал. работы ў Мінску: Белдзяржфілармонія (1963), Палац культуры трактарнага з-да (1965, абодва з Э. Вішнеўскай і інж. В. У. Паўлоўскай), музей гісторыі Вял. Айч. вайны (1964, з Г. Заборскім), гасцініца «Юбілейная» (1968, з У. Начаравым і інж. В. Л. Кантаровічам). Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

БЕНЯКОНІ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Ліда — Вільнюс. За 12 *км* на Пн ад Воранава, 145 *км* ад Гродна, на шашы Ліда — Вільнюс. 1726 ж., гасп. 502 (1970). Лесазавод, лясніцтва Лідскага лясгаса, млын, камбінат бытавога абслугоўвання. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, клуб, б-ка, 2 бальніцы, амбулаторыя, аптэка, адд. сувязі, 11 магазінаў. У 1910 у Б. заснавана адна з першых на Беларусі доследная с.-г. станцыя, існавала да 1959.

БЕРАГ СЛАНОВАЙ КОСЦІ (Côte d'Ivoire, БСК), дзяржава на З Афрыкі. На Пд абмываецца Гвінейскім залівам. Пл. 322,4 тыс. *км*², нас. каля 4 млн. чал. (1968). Сталіца Абіджан. БСК падзяляецца на 6 дэпартаментаў. Рэспубліка. Канстытуцыя прынята 3.11.1960. На чале дзяржавы і ўрада (Савета міністраў) стаіць прэзідэнт, які выбіраецца на 5 гадоў. Пры ўрадзе створаны кансультацыйны орган — эканам. і сацыяльны савет. Вышэйшы заканадаўчы орган — Нац. сход.

Прырода. Паверхня пераважна раўнінная. На Пн горы выш. да 1752 *м* (г. Німба каля стыку граніц Ліберыі, Гвінеі, БСК). Узбярэжжа нізіннае, з мелкаводнымі лагунамі. Карысныя выкапні: алмазы і марганцавая руда.





Вуліца ў Абіджане.

Клімат экватарыяльны на Пд і субэкватарыяльны на Пн. Т-ра паветра ў ліп. ад 28 да 34, часам да 40 °С, у студз. каля 24, часам паніжаецца да 9 °С. Ападкаў ад 2000 *мм* на ПдЗ да 1000 *мм* на ПнУ за год. На Пн сухі перыяд з ліст. да сакавіка. Асн. рэкі Комаэ, Бандама, Сасандра, Кавалі — лесасплаўныя. Глебы чырвона-жоўтыя і чырвоныя латэрытныя. Паўд. частку БСК займаюць шмат'ярусныя экватарыяльныя лясы. У цэнтр. частцы лесасавана з галерэйнымі лясамі ўздоўж рэк, на Пн — высакатраўная савана. Жывёльны свет: слоны, малпы, бегемоты, леапарды, гіены, шакалы, антылопы, кракадзілы, змеі, яшчаркі; з насякомых — тэрміты, муха цэцэ (на Пд).

Насельніцтва БСК складаецца з трох моўных груп: народы гвінейскай групы (бакве, гера, акан) — каля 55%, групы гур (сенуфа, лобі, куланга) — 23%, групы мандынга (бамбара, малінке, дыула) — 21%. Еўрапейцаў на тэр. БСК (пераважна французаў) 25 тыс. чал., найбольш у Абіджане. Большасць веруючых прытрымліваецца мясцовых традыц. вераванняў, мусульман каля 600 тыс., хрысціян-католікаў каля 300 тыс. Афіц. мова французская. Акрамя Абіджана (каля 400 тыс. ж., 1966), вылучаецца Бваке — гандл.-транспартны вузел унутр. часткі краіны.

Гістарычная даведка. Стараж. і сярэдневяковая гісторыя БСК вывучана недастаткова. Вядома, што паселішчы людзей на БСК былі ў час неаліту. У сярэднія вякі развіваліся рамёствы, гандаль. Ужо з 15 ст. тут іспавалі раннефеад. дзяржавы. У 18—19 ст. найбольш вядомыя Ідэніе, Конг, Дабу і інш. Першыя з еўрапейцаў на БСК з'явіліся партугальцы (15 ст.), а ў пач. 18 ст. на ўзбярэжжы выраслі факторыі еўрап. купцоў. У 1842—43 французы захапілі ўзбярэжныя пункты Гран-Басам і Асіні і зрабілі іх базамі калан. заваёў. У 1893 яны ўтварылі калонію БСК, якая ў 1904—58 уваходзіла ў склад Франц. Зах. Афрыкі. Эканоміка краіны была падпарадкавана інтарэсам манаполій метраполіі. Калан. рэжым вызначаўся асаблівай жорсткасцю, была ўведзена прымусовая праца. Вялікія антыкалан. паўстанні адбыліся ў 1894—96, 1902—08 і 1916. Толькі к 1915 французам удалося акупаваць усю краіну. 2-я сусв. вайна сарана Дэмакр. партыя. У 1946 БСК атрымаў статус «заморскай тэрыторыі». У 1949—51 у адказ на рэпрэсіі калан. улад адбыліся масавыя нар. выступленні. У 1956 БСК атрымаў унутр. аўтаномію. Пасля рэферэндуму 28.9.1958 абвешчаны рэспублікай у складзе франка-афрыканскага Супольніцтва. Рост нац.-вызв. руху прымусіў Францыю даць незалежнасць БСК (абвешчана 7.8.1960). Урад узначаліў Ф. Уфуэ-Буаньі — лідэр Дэмакр. партыі БСК. У крас. 1961 БСК разам з некаторымі інш. афр. дзяржавамі падпісаў пагадненне пра супрацоўніцтва з Францыяй, а ў маі — ваенны дагавор. У краіне ўсталявалася аднапартыйная сістэма. Пад кантролем Дэмакр. партыі ўсе прафесіян., маладзёжныя і жаночыя арг-цыі. З 20.9.1960 чл. ААН. У 1967 БСК устанавіў дыпламат. адносіны з СССР.

Гаспадарка. У эканоміцы гал. ролю адыгрывае с. гасп., якая спецыялізуецца на вытв. экспартных культур. На долю с. гасп. прыпадае 43% нац. даходу, на прамысл. і саматужніцтва — 19, на гандаль і транспарт — 24%. С.-г. угоддзяў 2,2 млн. *га*. Характэрны дробнаўласніцкія сялянскія гасп. Пад гал. харч. культурамі каля 1,1 млн. *га*, у т. л. пад рысам 22%, ямсам 18,5, кукурузай 16,5, маніёкам 14,7%. Рыс вырошчваюць пераважна на З, ямс і кукурузу ў цэнтры і на Пн, маніёк — усюды, акрамя Пн, асабліва на ПдЗ. Пад экспартнымі культурамі 784 тыс. *га*, у т. л. плантацыі дрэў кавы займаюць каля 300 тыс. *га*, какавы 210 тыс. *га*. Асн. раён плантацый — ПдУ. Сабрана (1967/68, тыс. *т*): кавы 250, какавы 140, бананаў 140, рысу 345. У 1966/67 ураджай асн. харч. культур склаў (тыс. *т*): ямсу 1859, маніёку 987, кукурузы 168. Вырошчваюць таксама ананасы, бавоўнік, маслінавую пальму. Жывёлагадоўля пераважна на Пн. У 1964 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 350, авечак і коз 1300, свіней 100. БСК імпартуе жывёлу з Верхняй Вольты і Малі. Улоў рыбы 57 тыс. *т* (1966). Нарыхтавана 2,8 млн. $м^3$ драўніны і піламатэрыялаў каштоўных парод (1966). Прамысловасць развіта слаба. Ёсць каля 70 прадпр. У 1968 здабыта 175 тыс. каратаў алмазаў (каля г. Тортыя) і 150 тыс. *т* марганцавай руды (каля г. Гран-Лаху). Вытворчасць эл. энергіі — 380 млн. *кат·гадз* (1968). Больш паловы яе далі ГЭС Аяме на р. Бія і ЦЭС у Абіджане. Гал. цэнтр прамысл.— Абіджан: аўта- і велазборачны з-д, суднаверф, вытв. тары і мукамольныя прадпрыемствы. У Бваке тэкст. ф-ка. Аўтамаб. дарог (1965) 33,1 тыс. *км*, у т. л. асфальтаваных 978 *км*. Адзіная чыгунка (даўж. 640 *км*) пераслкае краіну ад Абіджана на Пн. Адзіны сучасны порт — Абіджан. БСК экспартуе лесаматэрыялы, каву, какаву, ананасы, бананы, алмазы, марганец. Імпарт: тавары шырокага ўжытку, машыны, нафта і нафтапрадукты. Гал. гандлёвыя партнёры — Францыя і ЗША. Грашовая адзінка — афр. франк.

Асвета. Пач. школа 6-гадовая, мае тры цыклы (падрыхтоўчы, элементарны, сярэдні) па два гады кожны. Прымае дзяцей з 6 гадоў; у малодшых кл. яны займаюцца на мясцовых мовах (франц. мова вывучаецца з 1-га класа), у старэйшых кл. на франц. мове. У 1964/65 навуч. г. ў пач. школах вучылася 347 200 дзяцей. Сярэднія школы (на базе пач.) 7-гадовыя (ліцэі, каледжы), маюць 2 цыклы, падзеленыя на 4 і 3 гады навучання. У 1963/64 навуч. г. ў сярэдніх і нармальных школах (рыхтуюць настаўнікаў пач. кл.) вучылася 20 229 чал. Прафесіян. падрыхтоўку вядуць 4 і 7-гадовыя тэхн. ліцэі і 3-гадовыя цэнтры вучнёўства (на базе пач. школы). У 1958 у Абіджане васн. Цэнтр вышэйшай адукацыі (у 1964 ператвораны ва ун-т). Навук. ўстановы: цэнтр гуманітарных навук, н.-д. цэнтр заатэхніі; ін-ты: гігіены, бавоўны і тэкстылю тропікаў; каўчуку; садавіны і цытрусавых. У Абіджане нацыянальны музей, музей этнаграфіі. Штодзённая газета «Fraternité-Matin» («Брацтва раніцы»).

Літаратура. На мовах народаў БСК створаны багаты фальклор (гераічны эпас «Сундзята» на мове мандынга). Пасля 2-й сусв. вайны з'явілася л-ра на франц. мове, пераважна белетрызаваная публіцыстыка. Найбольш значны пісьменнік — Бернар Дадзье (н. 1916). У паэтычным зб. «Афрыка на ўвесь рост» паказаў рэвалюц. ўздым 40-х г. (калі паспяхова выступала першая масавая захадафр. паліт. партыя Афрыканскае дэмакратычнае аб'яднанне), упэўненасць у блізкай перамозе народа, класавую салідарнасць з працоўнымі розных краін і кантынентаў. Расправа каланізатараў з дзеячамі гэтай партыі прывяла Дадзье да духоўнага крызісу, які выявіўся ў рамане «Клемб'е»: герой твора перажыў крах надзей на блізкія сац. пераўтварэнні. Дадзье даследуе фальклор (зб. казак «Чорная павязка»), у публіцыст. кнігах «Негр у Парыжы» і «Патрон з Нью-Йорка» выступіў з крытыкай бурж. цывілізацыі. Вострым праблемам афр. рэчаіснасці прысвечаны раманы Ане Лаба «Какумбо — чорны студэнт», аповесць Сідыкі Дэмбеле «Бескарысныя».

Мастацтва. У выяўл. мастацтве найб. развіта скульптура — вельмі выразныя драўляныя разьбяныя фігуркі людзей (40—60 *см* вышыні). Дзверы, табурэткі, барабаны, маскі часам аздабляюцца маст. разьбой. Пашыраны залатыя, бронзавыя і медныя ювелірныя вырабы: гіркі для залатога пяску, талісманы. З даўніх часоў існуе ткацтва, вырабляюцца стужкі з вышываным арнаментам, якія потым сшываюцца для нац. адзення «бубу».


Літ.: Блохин Л. Ф. Берег Слоновой Кости, М., 1967; Сиденко В. П. Республика Берег Слоновой Кости, М., 1963.

М. А. Смірноў (прырода, гаспадарка), *І. Д. Нікіфарава* (літаратура). Масква; *Г. А. Чарнушчанка* (гістар. нарыс). Мінск.

БЕРАГАВАЯ, вёска ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., у якой знаходзіцца Расонскі льнозавод. На паўд.-зах. ускраіне воз. Расонскае і на р. Расонка. Падпарадкоўваецца Расонскаму гарпасляковаму Савету. За 3 *км* на ПдЗ ад Расонаў, 179 *км* ад Віцебска, 52 *км* ад чыг. ст. Дрэтунь. 115 ж., дваroў 37 (1970). Клуб, магазін.

БЕРАГАВАЯ АБАРОНА, баявыя сілы і сродкі ваенна-марскога флоту, арганізаваныя ў асобную сістэму для абароны важных пунктаў і ўчасткаў узбярэжжа ад нападу ворага з мора, паветра, сушы.

Засцерагае ваен. базы, порты, стаянкі флоту ад высадкі дэсанта праціўніка, блізкія да берагу водныя раёны ад загараджальных, тралавых і інш. дзеянняў варожых караблёў, садзейнічае сухап. войскам у ахове прыморскага фланга арміі. Сродкі Б. а.— берагавая артылерыя, мінныя загароды, баявыя караблі, авіяцыя і сухап. войскі. Пасты назірання на ўчастках Б. а. маюць дальнамеры, цеплапеленгатары, радыётэхн. станцыі, пранжэктары.



Драўляная маска. Народ дан. Прыватныя зборы (злева). Разьбяныя дзверы. Народ сенуфа. Універсітэцкі музей. Філадэльфія.

БЕРАГАВАЯ ЛАСТАЎКА, бераžанка (Riparia riparia), птушка атрада вераб'іных. Даўж. 12—15 *см*. Апярэнне зверху шаравата-бурае, знізу белае. Пашырана ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы і Паўн. Афрыцы; на Беларусі — па ўсіх рэках з высокімі абрывістымі берагамі, дзе гняздуецца калоніямі. Прылятае разам з інш. ластаўкамі ў пач. мая. У нару-гняздо кладзе 4—6 яец. Птушаняты пакідаюць гняздо на 19—20-ы дзень. Кормяцца Б. л. насякомымі. Ляцяць у вырай вялікімі чародамі ў канцы жніўня — пач. верасня.



БЕРАГАВОЙ Георгій Цімафеевіч (н. 15.4. 1921, с. Фёдараўка Карлаўскага пав. Палтаўскай губ.), лётчык-касманаўт СССР. Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1968), ген.-м. Засл. лётчык-выпрабавальнік СССР (1961). Чл. КПСС з 1943. Скончыўшы Яканкіеўскі аэраклуб, паступіў у Луганскую школу ваенных лётчыкаў (1938). З 1941 служыць у ВПС. З пач. Айч. вайны ў дзейнай арміі. Зрабіў 185 баявых вылетаў. Пасля вайны скончыў Вышэйшую афіцэрскую школу, курсы лётчыкаў-выпрабавальнікаў, у 1956 Ваенна-паветр. акадэмію. У 1948—64 лётчык-выпрабавальнік. У 1964 залічаны ў атрад сав. касманаўтаў. 26—30.10.1968 пілатаваў касм. карабель «Саюз-3», які збліжаўся з караблём «Саюз-2» і манеўраваў у касм. прасторы. Дэп. Вярх. Савета СССР 8-га скл.

БЕРАЖКОЎ Мікалай Георгіевіч [12(24).6. 1886, Ніжні Ноўгарад — 12.3.1956], савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1946). У 1911 скончыў гісторыка-філал. ф-т Маск. ун-та і пакінуты пры ім для навук. дзейнасці. Адначасова працаваў у Маскоўскім архіве Мін-ва юстыцыі. У 1919—23 выкладаў у ВНУ Масквы, Ніжняга Ноўгарада, Разані. У 1924—34 працаваў у Музеі рэвалюцыі, у 1935—51 — у Ін-це гісторыі АН СССР. Вывучаў гісторыю і крыніцазнаўства Вял. кн. Літоўскага, Беларусі эпохі феадалізму. У апошнія гады жыцця даследаваў храналогію рус. летапісаў.

Тв.: Литовская Метрика как исторический источник, ч. 1, М.— Л., 1946; (разам з А. І. Барановічам) Белоруссия, у кн.: Очерки истории СССР. Период феодализма XVII в., М., 1955; Хронология русского летописания, М., 1963.

Літ.: Улащик Н. Н., Н. Г. Бережков, у кн.: Проблемы источниковедения, [зб.] 6, М., 1958.

М. М. Улашчык. Масква.

БЕРАЖНОЕ, вёска ў Столінскім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Гарынь (1,5 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 18 *км* на ПнУ ад Століна, 263 *км* ад Брэста, 25 *км* ад чыг. ст. Гарынь, на шашы Столін — Давыд-Гарадок. 2456 ж., двароў 705 (1970). За 2 *км* ад Б. Нова-Беражноўскі сока-вінны з-д; у Б. філіял Столінскага прамысл. камбіната, цагельня, рамонтна-мех. майстэрня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя і музычная школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі, 6 магазінаў. На брацкай магіле скульптура воіна на ўшанаванне памяці тых, што загінулі ў Вял. Айч. вайну. На беразе Гарыні ва ўрочышчы Садок знойдзены прылады неалітычнай эпохі. Б. ўпамінаецца ў гістарычных дакументах з 1508.

БЕРАЗВЕЦКАЯ ЦАРКВА, помнік архітэктуры барока. Пабудаваная ў в. Беразвецча Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці ў 1756—63, уваходзіць у комплекс былога уніяцкага манастыра. Б. ц.— трохнефавая базіліка (сярэдні неф з вялікай алтарнай часткай шырэйшы і вышэйшы за бакавыя). Гал. фасад абрамляюць стройныя вежы, аб'яднаныя фігурным грэбенем. Трансепт і алтарная частка знадворку адзначаны ламанымі шчытамі. Размешчаныя на адным узроўні шчыты і грэбень утвараюць дэкар. карону будынка. Алтар і інтэр'ер Б. ц. вызначаюцца манумент. ураўнаважанай пластыкай і прыгажосцю ўбранства.



Галоўны фасад Беразвецкай царквы.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 521—523; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969, с. 159.

У. А. Чантурыя. Мінск.

БЕРАЗВЕЦКІ ЛАГЕР СМЕРЦІ, створаны нямецка-фашысцкімі акупантамі каля в. Беразвецча Глыбоцкага р-на Вілейскай вобл. для масавай загубы савецкіх ваеннапалонных. У верасні 1941 тэрыторыю былога уніяцкага манастыра, дзе ўцалеў толькі адзін двухпавярховы будынак, гітлераўцы абнеслі калючым дротам. Вязняў наўмысна трымалі пад адкрытым небам, іх амаль не кармілі. Ад холаду, голаду, хвароб і непасільнай працы штодня гінулі сотні людзей. Фашысты ўчынялі масавыя расстрэлы вязняў. Зімой трупы не паспявалі вывозіць і закопваць, іх кідалі ў возера. Пасля выхаду Італіі з гітлераўскай кааліцыі з канца 1943 у лагер прывозілі на загубу італьян. салдатаў. Каб замесці сляды сваіх злачынстваў, гітлераўцы перад расстрэлам раздавалі асуджаных, адбіралі ў іх дакументы і асабістыя рэчы. За час існавання лагера з вер. 1941 да ліп. 1944 нямецкія фашысты закатавалі тут каля 27 тыс. чал.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944, [2 изд.], Мн., 1965, с. 301—302; Михайлов В. В. и Романовский В. Ф. Нельзя простить, Мн., 1967; Немецко-фашистский оккупационный режим, М., 1965.

А. І. Валахановіч. Мінск.


БЕРАЗІНО, горад, цэнтр Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. Прыстань на р. Бярэзіна (прыток Дняпра). За 101 *км* на У ад Мінска, 50 *км* ад чыг. ст. Градзянка, на шашы Мінск — Магілёў. 6,6 тыс. ж. (1969). У 19 ст. мястэчка, вядомае раней сваім кірмашом, належала графам Патоцкім. Былі цагельні і вапельні, будаваліся непаравыя судны. З-ды: торфабрыкетны, спіртавы, пладова-агародніны, маслазавод; камбінаты харчовы і быт. абслугоўвання; аддз. Белсельгастэхнікі. 2 сярэд. школы, школа-інтэрнат і музычная; 2 дзіцячыя сады, яслі, прафесійна-тэхн. вуч. тарфянікаў; Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. На левым беразе Бярэзіны ва ўрочышчы Прыбар стаянка эпохі неаліту.

БЕРАЗІНО, вёска ў Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., на р. Бярэзіна (прыток Дняпра). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Чырвонабярэзінскі». За 30 *км* на У ад Докшыц, 160 *км* ад Віцебска, 40 *км* ад чыг. ст. Лепель. 805 ж., двароў 232 (1970). 2 лясніцтвы, сплаўны ўчастак. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад і яслі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 5 магазінаў.

БЕРАЗНІКІ, горад абласнога падпарадкавання ў Пермскай вобл. РСФСР. Прыстань на Каме і чыг. ст. 145 тыс. ж. (1970). Паблізу Б. радовішчы спажыўной, магніевай і калійнай соляў. Буйны цэнтр хім. прамысловасці (калійны, хім. і тытана-магніевы камбінаты; з-ды: содавы, азотнатукавы). ЦЭС. Агульнатэхнічны ф-т Пермскага політэхн. ін-та. Тэхнікумы: хім.-механічны, буд.; мед. і муз. вучылішчы. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

БЕРАЗНЯКІ, гарадзішча дзякоўскай культуры (3—5 ст.) каля в. Бераззнякі Рыбінскага

Беразіно. Будынак райвыканкома і райкома КПБ.



р-на Яраслаўскай вобл. Даследавана ў 1934—35 П. М. Трацяковым. Выяўлены рэшткі драўляных умацаванняў, комплекс жылых, грамадскіх і гасп. будынкаў, у т. л. свіран, кузня, памяшканні для прадзіва і для пахавання рэштак спаленых нябожчыкаў. Жыхары Б. займаліся жывёлагадоўляй, лядным земляробствам, паляваннем і рыбалоўствам; былі развіты ліццё бронзы, апрацоўка дрэва, косці і інш.

Літ.: Третьяков П. Н. К истории племен Верхнего Поволжья в первом тысячелетии н. э., М.—Л., 1941 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 5). *А. Р. Мітрафанаў.* Мінск.

БЕРАЗНЯКІ, вёска ў Вайханскім с/с Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Усыса. Цэнтр калгаса імя Крупскай. За 17 *км* на ПдЗ ад Гарадка, 45 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Гарадок. 146 ж., гасп. 47 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. Абеліск на брацкай магіле 5 афіцэраў Сав. Арміі, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЕРАЗНЯЦКІ КАНАЛ, частка асушальнай сістэмы ў нізоўі р. Случы. Даўж. 30 *км*. Пачынаецца за 1,5 *км* на У ад в. Бераззнякі ў Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл. Праходзіць па аблесенай, забалочанай, дробнаўгорыстай мясцовасці і ўпадае злева ў магістральны канал Галоўны за 7 *км* ад яго вусця (правы прыток Случы). У верхняй і ніжняй частцы Б. к. прымае некалькі каналаў (даўж. 5—8 *км*).

БЕРАЗЦЫ, вёска ў Столінскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета. Прыстань на р. Прыпяць, за 43 *км* на ПнЗ ад Століна, 220 *км* ад Брэста, 17 *км* (па рацэ) ад чыг. ст. Прыпяць. 966 ж., двароў 238 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, шавецкая майстэрня. У Вял. Айч. вайну Б. спалены фашыстамі. Помнік-абеліск сав. воінам і партызанам, якія загінулі пры вызваленні вёскі ад ням.-фаш. захопнікаў.

БЕРАЗЯКІ 1-я, вёска ў Навасельненскім с/с Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Парыжская камуна». За 25 *км* на ПдЗ ад Краснаполля, 155 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад прыстані Прыбар (на р. Сож), 70 *км* ад чыг. ст. Камунары. 312 ж., двароў 89 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін. У 1905 сялянс Б. 1-х актыўна выступалі супраць памешчыкаў і царскай улады. У Айч. вайну каля вёскі дзейнічаў спецатрад Героя Сав. Саюза М. В. *Зябніцкага.* Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі ў 1943.

БЕРАНДЗЕІ, цюркскае вандроўнае племя. У рус. летапісах упамінаюцца з 1097 да канца 12 ст. У 2-й пал. 11 ст. Б. аселі ў стэпах на Пд ад Кіеўскага і Пераяслаўскага княстваў па р. Росі. Конніцу Б. кіеўскія князі выкарыстоўвалі для барацьбы з полаўцамі і ў міжусобіцах. У часы нашэсця татара-манголаў у 13 ст. Б. зліліся з насельніцтвам *Залатой Арды.*

БЕРАНЖЭ (Béranger) П'ер Жан (19.8.1780, Парыж — 16.7.1857), французскі паэт. З сям'і дробнага службоўца. У творчасці развіваў традыцыі франц. нар. песні. Пасля ранніх жартоўна-іранічных і лірычных песень пра каханне і радасці жыцця перайшоў да сац.-паліт. паэзіі («Кароль Івето»— сатыра на захопніцкія войны Напалеона). У перыяд Рэстаўрацыі крытыкаваў рэакц. царкву і дваранства («Місіянеры», «Святыя айцы», «Смерць Сатаны», «Маркіз дэ Караба», «Белая кукарда», «Чалабітная пародзістых сабак»). За апазіц. вершы двойчы сядзеў у турме. Дэмакратызмам прасякнуты песні пра простых людзей, іх незалежнасць, бескарыслівае каханне і дружбу («Парады Лізы», «Пад самым дахам», «Новы фрак»). Пасля рэв. 1830, у якой Б. ўдзельнічаў, выкрываў бурж. манархію Луі Філіпа, яе міністраў і банкіраў («Бандзі», «Грошы», «Золата», «Сябрам міністрам»), спачуваў абяздоленым («Стары бадзяга», «Рыжая Жана»). Вершы «Вар'яты», «Патоп», «Ідэя» напісаны пад уплывам ідэй утапічнага сацыялізма. Стварыў гімн міру «Свяшчэнны саюз народаў», апяваў гераізм рэвалюц. народа («Чатырнаццатага ліпеня», «Стары капрал», «Мая рэспубліка», «Ліпеньскія магілы»). Песні Б. простыя, але не спрошчаныя. Кожная мае пэўны сюжэт; вобразы акрэсленыя і выразныя. Афарыст. рэфрэны, якія выражаюць асн. думку песні,— вострая зброя ў барацьбе з рэакцыяй. К. Маркс называў Б. бессмяротным. Яго творы за глыбокую народнасць, рэалізм і высокую паэтычнасць прапагандавалі рэвалюц. дэмакраты В. Бялінскі, М. Чарнышэўскі, М. Дабралюбаў, М. Міхайлаў, В. Курачкін. У сав. час на бел. мову Б. пераклі Э. Агняцвет, на рус.— П. Антакольскі і інш.



Тв.: Бел. пер.— Выбраныя песні, Мн., 1960; рус. пер.— Полн. собр. песен, т. 1—2, 2 изд., М.— Л., 1936; Сто песен, М., 1957; Сто песен, М., 1966.

Літ.: Данилин Ю. Беранже и его песни, М., 1958; Муравьева Н. И. Беранже, М., 1965 (Жизнь замечательных людей); Барычаўскі Я. І. Песні Беранжэ (да 70-годдзя з часу яго смерці), «Маладняк», 1932, № 7.

БЕРАНШТЭЙН Фелікс Якаўлевіч [н. 11(24).11.1904, г. Роўна, Украіна], беларускі савецкі біяхімік. Д-р біял. н. (1939), праф. (1948). Чл. КПСС з 1940. Скончыў Харкаўскі вет. ін-т у 1926. Заг. кафедры біяхіміі Камянец-Падольскага зоатэхнічнага ін-та (1930—35), Віцебскага вет. ін-та (1935—41), аналітычнай хіміі Куйбышаўскага індустр. ін-та (1941—45), біяхіміі Віцебскага вет. ін-та (з 1945). Вывучае мікраэлементы, іх ролю і значэнне ў жывёлагадоўлі, пытанні клінічнай вет. біяхіміі, фізіка-хім. ўласцівасці біярган. рэчываў. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Микроэлементы, их биологическая роль и значение для животноводства, Мн., 1958; Микроэлементы в физиологии и патологии животных, Мн., 1966.

БЕРАСНЁЎ Рыгор Яфімавіч (1916, в. Касіха Барнаульскага пав. Томскай губ.— 26.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з ліст. 1943. Вызначыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны па тэр. Віцебскай вобл. 26.6.1944 з групай байцоў пад агнём ворага пераправіўся на левы бераг ракі каля г. п. Ула. Загінуў у рукапашным баі за плацдарм.

БЕРАСТ, вяз лісцяваты, карагач (Ulmus foliacea), дрэва ці куст сямейства вязавых. Выш. да 30 *м*, кара цёмна-шэрая, глыбока патрэсканая. Лісце нераўнабокае, на доўгіх чаранках, цвёрдае, пілаватае. Кветкі з іржава-чырвонымі калякветкамі, у густых пучках. Плод — сплюшчаны арэшак (крылатка). Размнажаецца насеннем, парасткамі, каранёвымі атожылкамі. Святлолюбная, засухаўстойлівая расліна. Расце ў Паўд. і Зах. Еўропе і М. Азіі. У СССР на Пд Еўрап. часткі ў мяшаных і шыракалістых лясах, у поймах рэк, у гарах і стэпах. Вырошчваюць для аховы арашальных каналаў, замацавання схілаў. На Беларусі Б. (пар. назвы: лём, ільмак) часам траплялецца ў лясах на Пд і З; вырошчваецца як дэкаратыўнае дрэва ў садах і парках. Драўніна ідзе на шпалы, фанеру, мэблю. З кары вырабляюць жоўтую фарбу і дубільнікі. Насенне багатае на алей, лісце мае вітамін С. Меданос.



Бераст: *1* — галінка з кветкамі; *2* — галінка з лісцем і пладамі.

Н. В. Казлоўская. Мінск.

БЕРАСТАВЕЦКІ ГАРЫЗОНТ (бераставецкая світа, свіслацкая світа, ратайчыцкая світа), адклады верхняй часткі разрэзу *валынскай серыі* вендскага комплексу верхняга пратэразою на захадзе Рускай платформы. На Беларусі складаецца з эфузіўных (на ПдЗ), піракластычных і вулканагенна-асадкавых (пераважна на ПнУ) горных парод вулканагеннай фармацыі. Магутнасць ад 300 *м* на ПдЗ (Брэсцкая ўпадзіна) да некалькіх дзесяткаў метраў на ПнУ.


БЕРАСТАВІЦА, пасёлак у Бераставіцкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр Цецяроўскага с/с. Чыг. ст. на лініі Ваўкавыск — Беласток (ПНР). За 10 *км* на ПдЗ ад Вял. Бераставіцы, 70 *км* ад Гродна, на шашы Гродна — Баранавічы. 1105 ж., двароў 352 (1970). Аўтабаза, механізаваны кар'ер, бурака- і збожжаприёмны пункты, эл. станцыя, пякарня, павільён раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад, аддз. сувязі, аптэка, сталовая, 4 магазіны.

БЕРАСТАВІЦКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. На захадзе вобл., у сярэднім цячэнні р. Свіслач (бас. Нёмана). Пл. 0,9 тыс. *км*². Нас. 26 тыс. чал.



(1969). Падзяляецца на 9 сельсаветаў. Цэнтр г. п. Вялікая Бераставіца.

На большай частцы раёна адгор'і Ваўкавыскага ўзв. з хваліста-платопадобным рэльефам. На Пн частка Нёманскай азёрналедавіковай нізіны, на ПнЗ украіна Гродзенскага ўзв. Пераважаюць выш. 100—200 *м*. над узроўнем мора. Карысныя выкапні: радовішча торфу Арлоўскае — 3,6 млн. *т*, радовішча цагельных глін Знайдзіна (пас. Знайдзіна) — 1,3 млн. *м*³, радовішча буд. пяскоў — 0,7 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —4,9, ліп. 18,1 °С. Ападкаў 530 *мм* за год. Вегет. перыяд 200 дзён. Рэкі належаць да бас. Нёмана: Свіслач з прытокамі Цішаўка, Бераставічанка, Верацейка, Успарка, Одла. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (70,4%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (4,7%), дзярнова-балотныя (13,7%), тарфяна-балотныя (2,5%) і інш. З мінеральных глебаў 32% сугліністых, 60 супясчаных, 7% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 43 (цана бала 0,23 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 27, усіх сельскагаспадарчых угоддзяў — 40. Пад лесам каля 10% тэр., пераважае хвоя. Насляюць раён беларусы, ёсць рускія, палякі. Сярэдняя шчыльн. 29 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 11%.



Бераставіцкі пункт прыёмкі цукровых буракоў.

Прамысл. прадпрыемствы: масласырзавод, цагельня, спірт. з-д, карамельны цэх, аддз. «Пачобуты» торфапрадпрыемства «Вішнеўка», камбінат быт. абслугоўвання, хлебазавод, каўбасны цэх і цэх безалкагольных напіткаў. Раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Міжкалгасбуд. У раёне 19 калгасаў, саўгас і птушкафабрыка (1970).


Калгасы і іх цэнтры: «Авангард» (*Кватары*), «Бальшавік» (*Карпаўцы*), «Гвардыя» (*Вялікія Эйсманты*), імя Горкага (*Пархімаўцы*), «Грыцавічы» (*Клепачы*), імя XXII з'езду КПСС (*Канюхі*), «Дружба» (*Ліпкі*), імя Жданава (*Цецяроўка*), «Зара» (*Пачобуты*), «Іскра» (*Малыя Эйсманты*), імя Леніна (*Алекшыцы*), «Перамога» (*Старыя Дворац*), «1 Мая» (*Вайцехаўшчына*), «Праўда» (*Шалянкі*), «Свіслач» (*Вялікія Едкаўцы*), «17 верасня» (*Пайлюшкі*), імя Чарняхоўскага (*Красная*), «Чырвоны Кастрычнік» (*Вялікая Бераставіца*), «Шлях да камунізма» (*Паплаўцы*). Саўгас «Бераставіцкі» (*Масаляны*).

С. гасп. спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі і буракасеянні. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 53% тэр. раёна. На 1.1.1970 асушана 2,2 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная плошча ў 1970 (тыс. *га*) 36,6, у т. л. пад збожжавымі і вернебабовымі 15,6, бульбай 5,0, кармавымі 14,4, тэхнічнымі (цукр. буракі) 1,3. На 1.1.1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 29,5 (у т. л. кароў 12,7), свіней 29,3, авечак і коз 1,7. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка в. Бераставіца — Ваўкавыск, шаша Гродна — Ваўкавыск.

На пач. 1970 у раёне было 46 агульнаадук. школ (у т. л. 8 сярэдніх, 13 васьмігадовых, 25 пачатковых), 2 школы рабочай і сельскай моладзі, сельскае прафесійна-тэхн. вуч., 5 дашкольных устаноў, дзіцячая спарт. школа, муз. школа, 37 б-к, 34 клубы, 38 кінаўстановак (у т. л. стацыянарных 34), 3 бальніцы, 14 фельч.-акушэрскіх пунктаў. На пач. 1970 у раёне працавала 329 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 60 аграномаў, 17 інжынераў, 27 заатэхнікаў, 11 вет. урачоў, 15 эканамістаў, 174 настаўнікі, 25 урачоў; 425 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газета «За камунізм».

А. А. Шайрова. Мінск.

Жылыя дамы ў калгасе «Гвардыя» (в. Вялікія Эйсманты).



БЕРАСТАЎ Фёдар Сяргеевіч (10.1.1922, с. Глыбокае Усць-Каменагорскага пав. Сяміпалацінскай вобл.— 27.10.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з мая 1942. Вызначыўся ў баях пад Віцебскам. 22.6.1944 стралковае аддзяленне, якое ўзначальваў Б., з боем паглыбілася ў абарону ворага. Б. закідаў гранатамі фашысцкі дзот і знішчыў 3 кулямёты. 24.6.1944 у ліку першых фарсіраваў Зах. Дзвіну. Загінуў у баі на тэр. Латвіі.

БЕРАСЦЕЙСКАЯ ЗЯМЛЯ, тэрыторыя ў басейнах сярэдняга цячэння Зах. Буга і Нарава ў раннефеадальны перыяд. Размяшчалася на важных гандл. шляхах і была дастаткова цэльнай у фізіка-геагр. і эканам. адносінах. Найбольшыя гарады: Бярэсце (Брэст), Бельск, Дарагічын, Камянец, Кобрын, Мельнік і інш. З 10 ст. ў складзе Кіеўскай Русі, з канца 11 да сярэдзіны 12 ст. пад уладай тураўскіх, потым валынскіх князёў. У 11—13 ст. тут сутыкаліся інтарэсы кіеўскіх, турава-пінскіх, мінскіх, галіцка-валынскіх, а ў 14 ст. і літоўскіх князёў з інтарэсамі польскіх феадалаў. Польскія князі Казімір II у 1179 і 1182, Конрад Мазавецкі і Лешка Кракаўскі ў 1210 часова захоплівалі пабужскія землі і г. Бярэсце; дарагічынскую воласць захапілі нямецкія рыцары Дабжынскага ордэна, якія ў 1237 разбіты і выгнаны валынскім кн. Данілам Раманавічам. Паводле ўскосных звестак Іпацьеўскага летапісу ў 1240 з Пд уварваліся татара-манголы, пад Бярэсцем адбылася бітва, аднак Берасцейшчына імі не была заваявана. З 1-й пал. 14 ст. Б. з. ў складзе Вял. кн. Літоўскага. Лічылася часткай удзела Кейстута і яго нашчадкаў (акрамя Кобрынскай воласці, якая адышла да Альгерда). У 1349 на пэўны час Бярэсце захапіў польскі кароль Казімір III. У 1382 князь Януш Мазавецкі, скарыстаўшы ўнутраную барацьбу паміж Ягайлам і Кейстутам, уварваўся ў Б. з., асадзіў Бярэсце, захапіў Дарагічын, Мельнік і інш. З 1413 Б. з. ў складзе Троскай дзяльніцы (ваяводства); у 1520 ператворана ў Падляскае ваяводства, якое складалася з 6 пав.: Бельскага, Берасцейскага, Дарагічынскага,

Камянецкага, Кобрынскага, Мельніцкага. У 1566 створана Берасцейскае (пазней Брэст-Літоўскае) ваяводства, куды, акрамя Б. з. (без Зах. Падлясся), увайшла і частка турава-пінскага Палесся.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т. 2 — Ипатьевская летопись, М., 1962; Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси, М., 1950; Гринблат М. Я. Белорусы, Мн., 1968.

С. А. Шчарбакоў. Мінск.



Берасцейская грамата з Віцебска.

БЕРАСЦЕНЬ Акім Іванавіч (1877, Бешанковічы Віцебскай губ.— г. см. невяд.), рэвалюцыянер, бальшавік. З рабочых. Чл. КПСС з 1898. У 1898 стварыў с.-д. гурток сярод рабочых Бранскага вагонабудаўнічага з-да. Удзельнік рэвалюц. руху ў Харкаве (1902), Віцебску і на Рыга-Арлоўскай чыг. (1903—08). Тройчы арыштаваны (1907, 1909, 1910). Хаваючыся ад царскіх улад, у 1910—14 жыў за мяжой. У 1914 працаваў у Гал. чыг. майстэрнях Рыгі. У 1-ю сусв. вайну ў арміі. У чэрв.— ліп. 1917 адзін са стваральнікаў Віцебскай арг-цыі інтэрнацыяналістаў, якая з вер. 1917 стала *Віцебскай арганізацыяй РСДРП(б)*, чл. яе к-та, дэлегат VI з'езду РСДРП(б). Пасля Кастр. рэвалюцыі чл. Мінскага Савета. Са студз. 1919 старшыня Мінскага чыг. рэвалюц. суда, з крас. 1919 старшыня ячэйкі РКП(б) чыгуначнікаў Мінска. У 1921 на службе пуці Віцебскага чыг. вузла, пазней — нач. буравых работ у Віцебску.

БЕРАСЦЯНКА, 1) лёгкі адна- або двухвёсельны човен. Аснова — драўляны каркас, абцягнуты спец. апрацаванай бяростай. Здаўна бытавала на Палессі, а таксама ў народаў Амурскага басейна (нанайцаў, ульчаў, эвенкаў). 2) Рэч, зробленая з бяросты: сявенька, табакерка, туяс (кораб пад ягады, мёд). Да пач. 20 ст. берасцяныя вырабы былі пашыраны сярод бел. сялянства.

БЕРАСЦЯНКА, *зяблік* (Fringilla coelebs), птушка атрада вераб'іных. Даўж. 9—10 *см*, маса 20—25 *г*. Галава шэрая з сінявatым адценнем, спіна карычневая, брушка (у самцоў) ружова-чырвонае, на крылах цёмныя і белыя палоскі. Самкі менш яркія. Пашырана ў Еўропе, Паўн.-Зах. Афрыцы, Зах. Азіі. На Беларусі Б. (нар. назва махнянка) — адна з самых шматлікіх лясных птушак, насяляе паркі і скверы. Гняздуецца на дрэвах. Нясе 5—6 яец, выседжвае 13 дзён. Гадуе за лета 2 патомствы. Прылятае ў 2-й дэкадзе сакавіка, ляціць у вырай у канцы верасня. Знішчае шкодных насякомых.



БЕРАСЦЯНЫЯ ГРАМАТЫ, пісьмы і дакументы 11—15 ст. на бяросце, выяўленыя пры раскопках старажытнарускіх гарадоў. Сведчаць, што ў Ст. Русі і ў Вял. кн. Літ. пісьменнасць была пашырана не толькі сярод феадалаў, духавенства, але і сярод простых гараджан, жанчын. Б. г.— каштоўная крыніца вывучэння гісторыі і мовы.

На тым баку бяросты, што прылягаў да дрэва, літары надрапвалі завостранай касцяной ці жалезнай палачкай — пісалам. На бяросце найчасцей пісалі прыватныя лісты пра бытавыя і гасп. справы («прышлі да мяне чалавека на кані... ды сарочку прышлі», «купі аўса», «аддай шлем», «прышлі мне чытання добрага»). У некат. граматах запісваліся феад. павіннасці, абавязацельствы, завяшчанні. Першая Б. г. выяўлена ў 1951 у Ноўгарадзе археал. экспедыцыяй А. У. Арцыхоўскага. Вядома каля 480 Б. г., знойдзеных у Ноўгарадзе, Смаленску, Старой Русе, Пскове.

У 1959 знойдзена Б. г. 13—14 ст. у Віцебску. Яе тэкст: «Ад Сцяпана к Няжылу. Калі ты прадаў адзенне, то купі мне жыта за 6 грыўняў. А калі чаго не прадаў, то прышлі мне ў паляўнасці. Калі ж прадаў, то, дабрадзей мой, купі мне жыта». Захоўваецца ў Віцебскім абл. краязнаўчым музеі.

Літ.: Арциховский А. В. и Тихомиров М. Н. Новгородские грамоты на бересте. (Из раскопок 1951 г.), М., 1953; Арциховский А. В. и Борковский В. И. Новгородские грамоты на бересте. (Из раскопок 1955 г.), М., 1958; Арциховский А. В. Новгородские грамоты на бересте. (Из раскопок 1958—61 гг.), М., 1963; Дрочениина Н. Н. и Рыбаков Б. А. Берестяная грамота из Витебска, «Советская археология», 1960, № 1. *Г. В. Штыхаў.* Мінск.

БЕРАЎ Майсей Залманавіч [н. 10(23).12. 1909, г. Веліж Віцебскай губ.], беларускі савецкі кінааператар. Засл. дз. маст. БССР (1967). Чл. КПСС з 1943. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930), Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1934). З 1934 на кінастудыі «Беларусьфільм» здымае хранік.-дакумент. і навук.-папулярныя фільмы. У 1941—45 франтавы кінааператар; удзельнічаў у здымках фільмаў «Разгром нямецкіх войск пад Масквой» (1942), «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1944) і інш. Паслявае. фільмы: «Белавежская пушча» (1947), «Савецкая Беларусь» (1950), «Соль зямлі» (1962), «Па Прыпяці» (1963), «Працаўнікі лесу» (1964), «Генерал Пушча» (1967) і інш. сюжэты для кінахронікі. Аўтар, рэж. і аператар фільма «Хлопчык і чапля» (1969). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

БЕРБЕРСКІЯ МОВЫ, група сваяцкіх моў карэннага белага насельніцтва Паўн. і Зах. Афрыкі. Належаць да *семіта-хамітскіх моў* і ўтвараюць моўныя астраўкі ў араб. асяроддзі. Падзяляюцца на дзве дыялектныя групы: 1) кабільская, бербер, шлёх, туарэг, зенага і інш. (пераважна на тэр. Марока, Маўрытаніі і Сахары); 2) сукупнасць моў пад агульнай назвай зенет (Алжыр, Туніс, Трыпалітанія). На Б. м. гаворыць каля 6 млн. чал. Мовам уласцівыя афіксацыя і ўнутраная флексія кораня, які можа складацца з дзвюх ці трох зычных. Большая частка моў беспісьмовая. Да гэтай групы адносяцца і мёртвыя мовы: лівійская, нумідыйская і гетульская.

Літ.: Завадовский Ю. Н. Берберский язык, М., 1967; Basset A. La langue berbère, London, 1952.

А. Л. Міхневіч. Мінск.

БЕРГ Аксель Іванавіч [н. 29.10(10.11).1893, Арэнбург], савецкі вучоны ў галіне радыётэхнікі, ваеначальнік. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1943), інж.-адм. (1955). Герой Сац. Працы (1963). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік 1-й сусв. і грамадзянскай войнаў (штурман, потым камандзір падводных лодак). З 1924 на пед. і навук. рабоце; у 1925 скончыў Ваенна-марскую акадэмію. У Вял. Айч. вайну нам. народнага камісара электрапрамысловасці і нам. старшыні савета па радыёлакацыі. У 1953—57 нам. міністра абароны. Распрацаваў шэраг праблем па радыётэхніцы, электроніцы, кібернетыцы, абаронай тэхніцы. Асн. навук. працы і падручнікі па электронных лямпавых генератарах, стабілізацыі частаты і самаўзбуджэнні генератараў, радыёпрыёмніках, радыёлакацыі, радыёпеленгаванні. З 1959 старшыня навук. савета па праблеме «Кібернетыка» пры Прэзідыуме АН СССР, з 1964 старшыня Міжведамаснага савета па праблеме «Праграмаванае навучанне». Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Избранные труды, т. 1—2, М.—Л., 1964.
Літ.: Аксель Иванович Берг, М., 1965 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР); Наши звезды, М., 1966, с. 71—87.

БЕРГ Леў Сямёнавіч [2(14).3.1876, г. Бендэры (Малдавія)— 24.12.1950], савецкі фізіка-географ і біёлаг. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1928), засл. дз. нав. РСФСР (1934), прэзідэнт Геагр. т-ва СССР (1940—50). Праф. Петраградскага (потым Ленінградскага) ун-та (1916). Адначасова працаваў у інш. навуч. і н.-д. установах Ленінграда. Вёў даследаванні ў Зах. Сібіры, Сярэд. Азіі, Паволжы, на Каўказе, Усх.-Еўрап. раўнінне і інш. Распрацаваў вучэнне пра ландшафты, глебавую тэорыю ўтварэння лёсаў, класіфікацыю клімату на ландшафтнай аснове. Займаўся лімналогіяй і іхтыялогіяй. Даследчык гісторыі рускіх геагр. адкрыццяў і Геагр. т-ва СССР. Дзярж. прэмія СССР 1951.



Тв.: Избранные труды, т. 1—5, М., 1956—62.
Літ.: Памяти академика Л. С. Берга, М.—Л., 1955 (бібліягр.).

БЕРГ Мікалай Канстанцінавіч (1828—81), урач і грамадскі дзеяч. У 1853 скончыў мед. ф-т Маскоўскага ун-та. З 1853 працаваў у марскім ведамстве, у 1860—62 урач у Пензе, у 1862—64 інспектар урачэбнай управы ў Архангельску, у 1864—71 у Мінску. У 1863 заснаваў т-ва архангельскіх, у 1867 — мінскіх урачоў, прэзідэнтам якога быў да 1871. Дзейнасць т-ва мела санітарна-гігіенічны кірунак.

Літ.: Молчанов А. П. Забытое имя, «Неман», 1967, № 9.

БЕРГЕР Міхаіл Аркадзевіч [н. 15(28).8.1909, Мінск], беларускі савецкі піяніст і педагог. Засл. арт. БССР (1940). Чл. КПСС з 1940. Скончыў Бел. муз. тэхнікум (1928) і Ленінградскую кансерваторыю (1933, клас Л. Нікалаева). З 1937 дац., з 1946 праф. Бел. кансерваторыі. Аўтар фп. твораў (Варыяцыі, 1967; Эцюды, 1962; апрацоўкі нар. песень, дзіцячыя п'есы), Фантазіі для скрыпкі і фп. (1945) і інш.

БЕРГОЛЬЦ Вольга Фёдараўна [н. 3(16).5. 1910, Пецярбург], руская савецкая пісьменніца. Чл. КПСС з 1940. З сям'і ўрача. Скончыла філал. ф-т Ленінградскага ун-та (1930). У Айч. вайну была ў асаджаным Ленінградзе. Паэмы «Лютаўскі дзённік» (1942), «Ленінградская паэма» (1942), «Твой шлях» (1945), кн. «Гаворыць Ленінград» (1946)— пра гераізм ленінградцаў. Паэма «Першарасійск» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1950) пра подзвіг петраградскіх рабочых, будаўнікоў горада-камуны ў Сібіры. Аповесць «Дзённыя зоркі» (1959) напісана ў жанры «лірычнай прозы». Пераклала вершы «Добра было б...» М. Танка і «Герою» К. Буйло. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна і ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Набр. произв., т. 1—2, Л., 1967; бел. пер.— у зб.: Паэты Ленінграда, Мн., 1948.
Літ.: Павловский А. И. Стих и сердце, Л., 1962.

БЕРГСОН (Bergson) Анры (18.10.1859— 4.1.1941), французскі бурж. філосаф-ідэаліст, прадстаўнік *інтуітывізму*. Чл. Французскай акадэміі (1914). Сутнасць усёй рэчаіснасці тлумачыў як «працягласць» (durie) або «канкрэтны час», адарваны ад матэрыі, руху, развіцця ў прыродзе і грамадстве; лічыў «працягласць» унутранай, падсвядомай асновай псіхічных з'яў. Філасофія Б. блізкая да ірацыяналістычнай «філасофіі жыцця», распаўсюджанай у Германіі ў канцы 19 — пач. 20 ст. Гал. сродкам пазнання лічыў інтуіцыю, якую ўяўляў як містычнае разуменне з'яў. Пазнанне, паводле Б., гэта толькі пазнанне «працягласці»; выш. форма інтуітыўнага пазнання — маст. творчасць. Сацыяльна-паліт. погляды блізкія да багаслоўскага вучэння пра «горад зямны» і «горад божы». Б. вучыў, што асновай грамадскага жыцця з'яўляецца любоў, што гістарычны працэс мае стыхійны, ірацыянальны характар. Філасо-

фія Б.— тэарэт. аснова сучаснага *ірацыяналізму*. Нобелеўская прэмія па л-ры (1928).

Тв.: Собр. соч., т. 1—5, 2 изд., СПб., 1913—14.

Літ.: Плеханов Г. В. Анри Бергсон, у кн.: Избранные философские произведения, т. 3, М., 1957.

БЕРДАЎКА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 16 *км* на ПнУ ад Ліды, 150 *км* ад Гродна, на шашы Ліда — г. п. Іўе. 378 ж., гасп. 108 (1970). У Б. Лідская дзярж. племянная станцыя, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад-яслі, бальніца, адда. сувязі, сталовая, 2 магазіны. 2 помнікі сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЕРДЫГА́Н Казімір Іосіфавіч [н. 9(21).12. 1894, в. Паноры Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], беларускі стаматолаг. Д-р мед. н. (1958), праф. (1959). Чл. КПСС з 1946. У 1926 скончыў 1-ы Ленінградскі мед. ін-т. Удзельнік Айч. вайны. З 1958 заг. кафедры стаматалогіі Бел. дзярж. ін-та ўдасканалення ўрачоў. Асн. працы па лячэнні актынамікозу, вострых запаленняў сківічна-тварнай вобласці і пластычнай хірургіі твару. Чл. праўлення Усесаюзнага навук. т-ва стаматолагаў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Актиномикоз лица, челюстей и шеи и современные методы его лечения, Мн., 1955; Клиника и лечение повреждений челюстно-лицевой области, Мн., 1961.

Літ.: Казимир Иосифович Бердыган, «Здравоохранение Белоруссии», 1965, № 2.

БЕРДЫЖ, верхнепалеалітычная стаянка першабытнага чалавека за 0,5 *км* на Пд ад в. Падлужжа і 3 *км* на Пд ад в. Бердыж Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Адкрыта К. М. Палікарповічам (1926), даследавалася С. М. Замятніным (1927), Палікарповічам (1928—29, 1938—39), У. Дз. Будзько (1959—63). Б.— адно з найбольш старажытных паселішчаў чалавека на тэр. Беларусі і самы выразны ў гэтай групе помнік старажытнасці. У культурным пласце рэшткі фаўны (маманта, дзікага каня, першабытнага быка, шарсцістага насарога, бурага мядзведзя, ваўка, сусліка, пясца, паўн. алення, магчыма, зубра і інш.), расшчэплены крэмень, касцяны і драўляны вугаль. Выяўлены рэшткі 2 паўзямлянкавых пабудоў авальнай (*м*) 4,5×3,4 і прадаўгаватай (*м*) 11×5,2 формаў. Іх аснова складзена з чарапоў і інш. касцей маманта. У сярэдзіне жытлаў расчышчаны рэшткі агнішчаў, знадворку — ямы-сховішчы. Знойдзены наканечнікі коп'яў з бакавой выемкай, разцы, скрабкі, вастрыі, нажы і пожападобныя пласціны, сякерападобныя прылады. Стаянка В. адносіцца да пачатковага этапа дзвінскай стадыі *валдайскага абледзянення*. Храналагічна яна блізкая да помнікаў тыпу Касцёнкі 1-я (Варонежская вобл.), Вілендорф 1-ы, 2-і (Аўстрыя) і з'яўляецца сувязным звяном помнікаў касцёнкаўска-аўдзееўскай культуры з аналагічнымі паселішчамі ў Чэхаславакіі, Аўстрыі, Францыі (24—23 тыс. гадоў да н. э.).

Літ.: Поликарпович К. М. Палеолит Верхнего Поднепровья, Мн., 1968; Будько В. Д. О жилищах Бердыжской палеолитической стоянки, «Краткие сообщения Института археологии», 1964, в. 101. *У. Дз. Будзько.* Гомель.

БЕ́РДЫШАЎ Васіль Архіпавіч [н. 8(21).3. 1908, в. Ніжнія Чомы Барнаульскага пав. Томскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з ліп. 1941. Вызначыўся 17.10.1943 пры фарсіраванні Дняпра каля в. Бывалькі Гомельскай вобл. У час пераправы сваім целам закрыў прабоіну ў лодцы, гэтым выратаваў стралковы дэсант. Жыве ў Новасібірску.

БЕ́РЗІН Рэйнгольд Іосіфавіч [4(16).7.1888, маёнтак Кінігсгоф Ліфляндскай губ.— 11.11. 1939], савецкі ваенны дзеяч. З батракоў. Чл. КПСС з 1905. З 1914 у арміі. У 1917 старшыня карпуснога рэўкома, чл. выканкома 2-й арміі (Нясвіж). Кіраваў войскамі Паўн. групы пры ліквідацыі контррэвалюц. Стаўкі ў Магілёве; камісар ВРК пры Стаўцы. Камандаваў 1-м Мінскім рэвалюц. атрадам, пазней 2-й рэвалюц. арміяй у барацьбе супраць Цэнтр. рады на Украіне. З пачатку ням. інтэрвенцыі галоўнакамандуючы Зах. рэвалюц. фронту на барацьбе з контррэвалюцыяй; з чэрв. 1918 камандуючы Паўн.-Урала-Сібірскага фронту, 3-й арміі Усх., 9-й арміі Паўд. франтоў. У 1919—24 чл. РВС Зах., Паўд., Паўд.-Зах., Туркестан. франтоў, потым — Зах. ваен. акругі. З 1927 на гасп. рабоце. Узнаг. залатой зброяй, ордэнам Чырв. Сцяга, ордэнамі Чырв. Зоркі Бухарскай народнай сав. рэспублікі і Чырв. Сцяга Харэзмскай ССР.



Тв.: Этапы в строительстве Красной Армии, у кн.: Этапы большого пути, М., 1962.

З. Л. Кокіна. Рыга.

БЕ́РЗІН Ян Антонавіч [парт. псеўд. Земельс, Вінтэр; 29.9(11.10).1881, Веляўская вол. Ліфляндскай губ.— 29.8.1938], прафесійны рэвалюцыянер, партыйны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. Чл. КПСС з 1902. У 1903 высланы ў Алонецкую губ., адтуль у 1905 уцёк за мяжу. У 1906—07 чл. Пецярбургскага к-та РСДРП. З 1908 у эміграцыі; падтрымліваў сувязь з У. І. Леніным, супрацоўнічаў у бальшавіцкіх выданнях *«Пролетарий»*, *«Социал-демократ»*. У 1914 чл. рэдкалегіі цэнтр. органа с.-д. Латв. краю (СДЛК) газ. «Zihna» («Барацьба»), сакратар Замежнага бюро ЦК СДЛК. На VI з'ездзе РСДРП(б) выбраны чл. ЦК, на VII з'ездзе — канд. у чл. ЦК РКП(б); на II Усерас. з'ездзе Саветаў — чл. ВЦВК. У 1918 паўпрэд РСФСР у Швейцарыі, у 1919 нарком асветы Сав. Латвіі, у 1919—20 сакратар Выканкома Камінтэрна. З 1921 на дыпламат. рабоце ў Фінляндыі, Англіі, Аўстрыі, у Наркамаце замежных спраў СССР. З 1932 нач. Цэнтр. архіўнага ўпраўлення СССР і РСФСР, рэдактар час. «Красный архив». *В. С. Лейтан.* Рыга.

БЕ́РКАЎ Павел Навумавіч [2(14).12.1896, Белгарад-Днястроўскі — 9.8.1969), рускі савецкі літаратуразнавец. Чл.-кар. АН СССР (1960), праф. Ленінградскага ун-та (1936). Даследаваў пераважна рус. л-ру 18—20 ст., а таксама л-ру народаў СССР, узаемасувязі рус. і зарубежных л-р, гісторыю т-ра і журналістыкі, бел. стараж. і сучасную л-ру, кніга-знаўства, тэксталогію, тэхніку літ.-знаўчай работы, тэорыю і методыку бібліяграфіі. Навук. кіраўнік і адзін з рэдактараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1—2, 1968—69).

Тв.: Ломоносов и литературная полемика его времени. 1750—1765, М.—Л., 1936; История русской журналистики XVIII в., М.—Л., 1952; Введение в технику литературоведческого исследования, Л., 1955; Международное сотрудничество славистов и вопросы организации славяноведческой библиографии, М., 1958; О людях и книгах, М., 1965; Ф. Скарына і пачатак усходнеславянскага вершаскладання, у кн.: 450 год беларускага кнігадрукавання, Мн., 1968.

БЕРКЕНГЕЙМ Барыс Майсеевіч [25.4(7.5). 1885, Масква — 23.4.1959], савецкі хімік. Д-р хім. н. (1936), засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР (1945). У 1921—27 працаваў у Мінску: арганізатар і першы загадчык кафедры неарган., аналітычнай і фізічнай хіміі БДУ. Вывучаў састаў і ўласцівасці мінер. рэсурсаў БССР (фасфарыты, даламіты, вапнякі, гліны, пяскі, торф, грунтавыя і глыбінныя воды і г. д.). З 1927 працаваў у ВНУ Масквы, рэдактар хім. аддзела «Савецкай тэхнічнай энцыклапедыі» і «Даведніка хімічных, фізічных і тэхналагічных велічынь». З 1932 і да канца жыцця адзін з рэдактараў час. «Успехи химии». У Айч. вайну ў Пермі арганізаваў вытворчасць дэфіцытных медыкаментаў. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Борис Моисеевич Беркенгейм, «Успехи химии», 1959, т. 28, в. 5; Ермоленко Н. Ф., Тищенко И. Г. и Баркан А. С. Химия в Белорусском государственном университете им. В. И. Ленина (к 40-летию Октябрьской революции), «Ученые записки БГУ», 1958, в. 42.

БЕРКЛІ (Berkeley) Джордж (12.3.1685— 14.1.1753), англійскі філосаф, суб'ектыўны ідэаліст. З 1734 епіскап у Клойне (Ірландыя). На думку Б., рэчы і іх якасці з'яўляюцца сукупнасцю пачуццёвых уражанняў; аб'ектыўна, незалежна ад чалавека яны не існуюць; існаваць — значыць быць успрымальным. Адчуванні суб'екта Б. ператварыў у самастойную рэальнасць. Адрываў асобнае ад агульнага, лічыў, што існуе толькі асобнае і адзінкавае, а агульнае, у т. л. і матэрыяльная субстанцыя,— пустая абстракцыя. Імкнуўся адкінуць паняцце матэрыі, каб панесці паражэнне ўсяму матэрыялізму і абараніць бога. Нягледзячы на суб'ектывізм, уводзіць у сваю філасофію бога як першапрычыну свету і пераходзіць на пазіцыі аб'ектыўнага ідэалізму. Тэарэт. беспадстаўнасць і рэакц. сутнасць поглядаў Б. паказаў У. І. Ленін.

Тв.: Рус. пер.— Трактат о началах человеческого знания..., СПб., 1905.

Літ.: Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм. Замест уводзін, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18, с. 13—32).

БЕ́РКУТ (Aquila chrysaëtus), драпежная птушка сямейства ястрабіных. Даўж. каля 90 *см*, размах крылаў да 2 *м*, маса да 5 *кг*. Апярэнне цёмна-бурае. У маладых птушак большая частка хваста белая. Лапы дужыя, з вялікімі вострымі кіпцюрамі. Водзіцца Б. у лясной зоне і ў гарах Паўн. Афрыкі, Еўропы, Азіі і Паўн. Амерыкі. У БССР бывае ў час пралёту, гняздуецца і зімуе рэдка. Гнёзды робіць на дрэвах і скалах. Нясе 1—2 яйцы. Корміцца мярцвячынай, дробнымі млекакормячымі, земнаводнымі жывёламі і вялікімі насякомымі. Часам нападае на чалавека. У Сярэд. Азіі і ў Казахстане выкарыстоўваецца як лоўчая птушка на паляванні на зайцоў, лісоў, джэйранаў і ваўкоў. Ахоўваецца законам.



Літ.: Гл. пры арт. *Птушкі.*

БЕРЛІЁЗ (Berlioz) Гектор Луі (11.12. 1803, Кот-Сент-Андрэ — 8.3.1869), франц. кампазітар, дырыжор, музычны пісьменнік. Выдатны прадстаўнік франц. муз. рамантызму, стваральнік рамант. праграмнай сімфоніі, наватар у галіне інструментоўкі. Чл. Ін-та Францыі (1856). Пасля сканчэння Парыжскай кансерваторыі (класы Ж. Ф. Лесюэра і А. Рэйхі) у 1830 атрымаў Рымскую прэмію за кантату «Апошняя ноч Сарданапала». З 1842 гастраліраваў як дырыжор у многіх краінах (1847, 1867—68 у Расіі). Светапогляд Б. сфарміраваўся пад уплывам класічнай і рамант. л-ры, вызваленчых ідэй прэадцяня рэвалюцыі 1830, творчасці Л. Бетховена і музыкі франц. рэвалюцыі 18 ст. Росквіт творчасці Б. прыпадае на 1830—46. У творах таго часу раскрываюцца тэмы лёсу асобы («Фантастычная сімфонія», 1830), грамадз. і рэвалюц. (апр. «Марсельезы», 1830, «Рэквіем», 1837; «Жалобна-трыумфальная сімфонія», 1840). Многа вялікіх твораў напісана на сюжэты У. Шэкспіра (драм. сімфонія для аркестра, салістаў-спевакоў і хору «Рамэо і Джульета», 1839; опера «Беатрычэ і Бенядзікт», 1862, і інш.), І. В. Гётэ (драм. легенда «Асуджэнне Фаўста», 1846), Дж. Байрана (сімфонія «Гарольд у Італіі», 1834, і інш.); у аснову оперы «Бенвенута Чэліні» (1838) пакладзены літ. помнік эпохі Адраджэння — аўтабіяграфія славутага скульптара. Некаторыя праграмы Б. («Фантастычнай сімфоніі» і яе працягу «Лелію, ці Вяртанне да жыцця», 1831) маюць рысы аўтабіяграфічнасці. Карціннасць і сюжэтная канкрэтнасць набліжаюць стыль Б. да даўніх традыцый франц. музыкі. З характэрным Францыі панаваннем опернага жанру звязана імкненне Б. да тэатралізацыі сімфоніі («Рамэо і Джульета»), а таксама да спалучэння ў адным творы рысаў опернага, аратарыяльнага і сімф. жанраў («Асуджэнне Фаўста»). Ад масавых рэвалюц. святкаванняў 18 ст. Б. успры-



пяў манументальнасць, лапідарнасць тэм, аратарскія інтанацыі, грандыёзнасць арк. і хар. калектываў. Разам з тым даў многа ўзораў тонкай празрыстай аркестроўкі. Першы зрабіў інстр. тэмбры выразнікамі праграмнага замыслу. Тэхн. магчымасці, спосабы спалучэння муз. інструментаў і вобразныя сферы іх ужывання апісаў у «Вялікім трактаце па сучаснай інструментоўцы і аркестроўцы» (1844). Адмоўныя адносіны да рэвалюцыі 1848 — адна з прычын аслаблення наватарскага духу ў творах апошніх гадоў (аратарыяльная трылогія «Дзяцінства Хрыста», 1854; Te Deum для 3 хораў, арк. і аргана, 1855; оперная дылогія «Траянцы» паводле Вергілія, 1855—59). Б. пакінуў многа муз.-крытычных і публіцыст. артыкулаў і «Мемуары» (выд. 1870), у іх раскрываецца яго аблічча як чалавека і мастака.

Літ. тв.: Literarische Werke, Bd 1—10, Leipzig, 1903—12; рус. пер.— Дырыжор оркестра, 3 изд., М., 1912; Избранные статьи, М., 1956; Мемуары, 2 изд., М., 1967.

Літ.: Стасов В. В. Лист, Шуман и Берлиоз в России, М., 1954; Соллертинский И. Берлиоз, М., 1962; Хохловкина А. Берлиоз, М., 1960; Boschot A. L'histoire d'un romantique. Hector Berlioz, v. 1—3, Paris, 1946—50.

БЕРЛІН (Berlin), сталіца Германіі ў 1871—1945. Размяшчэнне на р. Шпрэе каля ўпадзення ў р. Гафель і наяўнасць суднаходных каналаў забяспечылі гораду сувязь з Балтыйскім і Паўночным морамі праз Эльбу і Одэр. Пл. да 1920 — 66 км², пасля далучэння прыгарадаў Вялікі Берлін займаў 878 км². На пач. 2-й сусв. вайны (1939) налічвалася 4,3 млн. ж.

Б. утварыўся з двух паселішчаў (Б. і Кёльн), якія ў 1307 зліліся ў адзін горад. З 1486 — сталіца Брандэнбургскага курфюрства, з 1701 — каралеўства Прусіі. У Сямігадовую вайну 1756—63 рускія войскі занялі Б. (1760), другі раз у 1813, калі праследавалі напалеонаўскую армію. Адзін з гал. цэнтраў рэвалюцыі 1848—49 у Германіі. З 1871 сталіца Германскай імперыі.


Да 18 ст. ў Б. існавала сярэдневяковая радыяльна-кальцавая планіроўка (збудаванняў таго перыяду амаль не асталося). У 18 — пач. 19 ст. Б. забудоўваўся па «шахматнай» рэгулярнай сістэме. Былі створаны правільныя плошчы, шырокія вуліцы (Унтэр-дэн-Ліндэн), парадныя ансамблі і будынкі ў стылі барока (Цайхгаўз, палац Музей ням. гісторыі, 1695—1706, арх. І. А. Нерынг, А. Шлютэр, Ж. дэ Вот; палац Шарлотэнбург, з 1695, Нерынг, 1701—12, Эазандэр фон Гётэ, флігель у стылі ракако, 1740—43, Г. В. Кнобельсдорф; у 1943—45 палац часткова разбураны; і інш.), класіцызму (Оперны т-р, 1741—43, Кнобельсдорф; палац прынца Генрыха, 1748—53, арх. І. Боўман, з 1810 ун-т; Брандэнбургскія вароты, 1788—91, арх. К. Г. Лангханс; Новая вартоўня, 1816—18, Драм. т-р, 1819—21, Стары музей, 1824—28, усе арх. К. Ф. Шынкеля). Ствараецца цэнтр з урадавымі будынкамі (райхстаг, 1884—94, арх. П. Валат, і інш.), забудоўваюцца гандлёвыя, жылыя арыстакратычныя раёны. У пач. 20 ст. будуецца шэраг арх. комплексаў і аб'ектаў у духу функцыяналізму (арх. П. Берэнс, Э. Мендэльзан, Г. Пёльцыг, В. Гропіус, Б. Таўт).

З канца 19 ст. Б. становіцца прамысл. цэнтрам з буйнымі заводскімі тэрыторыямі і пралет. раёнамі (Ведынг, Маабіт, Шпандаў і інш.). У 1-ю сусв. вайну — адзін з цэнтраў антываен. рабочага руху ў Германіі. 9.11. 1918 у Б. абвешчана Германская Рэспубліка, 30.12.1918—1.1.1919 праходзіў Устаноўчы з'езд кампартыі Германіі. У Б. адбыліся многія рэвалюц. выступленні пралетарыяту — студзеньскае паўстанне 1919, барацьба супраць капаўскага путчу ў сак. 1920, усеагульная забастоўка ў жн. 1923, барыкадныя баі ў маі 1929. У 1933—45 сталіца гітлераўскага «трэцяга рэйха». Эканоміка ў гэты перыяд мела ярка выяўлены індустрыяльны характар. Тут пад кантролем манаполій АЭГ, Сіменс, Осрам, Тэлефункен і інш. сканцэнтравалася палова ўсёй эл.-тэхн. прамысл. Германіі; была значная частка ням. агульнага машынабудавання, оптыка-механічнай, швейнай, харчовай і палігр. прамысловасці. У ходзе вайны колькасць насельніцтва Б. зменшылася на $^2/_5$; прычынены страты прамысл., транспарту, энергетыцы. У гады фаш. панавання ў Б. дзейнічалі падпольныя групы ням. антыфашыстаў (гл. *Чырвоная капэла*). Горад быў месцам жорсткіх баёў на заключным этапе 2-й сусв. вайны. 2.5.1945 штурмам узяты Сав. Арміяй (гл. *Берлінская аперацыя 1945*). Уваходзіў у сав. зону акупацыі. 5.6.1945 падпісана Дэкларацыя, паводле якой Б. быў пастаўлены пад сумеснае кіраванне чатырох дзяржаў. 17.7—2.8.1945 у Патсдаме, непадалёку ад Б., адбылася канферэнцыя кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (гл. *Патсдамская канферэнцыя 1945*). 21—22.4.1946 у Б. адбыўся Устаноўчы з'езд Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі. 7.10.1949 абвешчана Германская Дэмакратычная Рэспубліка. Савецкі сектар Б. стаў яе сталіцай. Зах. дзяржавы сепаратнымі дзеяннямі ліквідавалі чатырохбаковы статус Б. і прывялі да расколу яго на 2 часткі: усходнюю — Дэмакратычны Б. (гл. *Берлін*, сталіца ГДР) і заходнюю (гл. *Берлін Заходні*). Пасля вайны прамысл. вытворчасць у зах. сектарах горада аднаўлялася вельмі марудна. У сав. сектары ўжо ў 1949 аб'ём прамысл. прадукцыі значна перавысіў узровень 1936.

Літ.: Ludwig H. Berlin von gestern, Berlin, [1957].

БЕРЛІН (Berlin), сталіца ГДР, на рацэ Шпрэе і суднаходных каналах. Вузел чыг. і шашэйных дарог, авіялініі. 1,1 млн. ж. (1968). Найбольш развіта цяжкае і агульнае машынабудаванне, эл.-тэхн., харчовая, хім., швейная, паліграфічная прамысл. Самыя вялікія прадпрыемствы: з-д электраапаратуры, эл. станцыя Клінгенберг, трансфарматарны з-д імя К. Лібкнехта, кабельны, радыёзавод, суднабуд. верф, з-д электрамашынабудавання «Бергман-Борзіг», з-д цяжкага машынабудавання імя 7 Кастрычніка.


З 1950 у Б. ажыццяўляецца шырокая праграма аднаўлення і сацыяліст. горадабудаўніцтва (Карл-Маркс-Але, 1-я чарга з 1952, арх. Г. Гензельман, Р. Паўлік, Г. Гоп; 2-я з 1959, арх. В. Дучке, Э. Колейн, і інш.). Рэканструяваны і пабудаваны шматлікія прамысл. прадпрыемствы, адноўлены многія арх. помнікі, ідзе грандыёзнае жыллёвае буд-ва. Сярод збудаванняў: Дом радыёвяшчання, 1958, арх. Ф. Эрліх; Дом настаўніка, 1964, арх. Гензельман; тэлевізійная вежа (выш. 361,5 м). У Трэптаў-парку помнік воінам Сав. Арміі (1946—49, скульптар Я. Вучэціч, арх. Я. Белапольскі). У Б. ун-т імя Гумбальта, АН, АМ, ін-т Маркса — Энгельса — Леніна, Вышэйшая



1



2



3




4

Берлін.


1. Будынак Нацыянальнай галерэі. 1876. Праект арх. А. Шцюлера.
2. У цэнтры Берліна.
3—4. Помнік савецкім воінам у Трэптаў-парку. Скульптар Я. В. Вучэціч, арх. Я. Б. Белапольскі. 1946—49. Агульны выгляд. Фрагмент помніка.
5. Брандэнбургскія вароты. Арх. К. Г. Лангханс. 1788—91. Квадрыга скульптара І. Г. Шадава. 1789—94.
6. Індустрыяльная частка горада.



5



6










Бразілія. 1. Рыо-дэ-Жанейра. Прыморская частка горада. 2. На плантацыі кавы ў штаце Сан-Паўлу. 3. Сан-Паўлу. Агульны выгляд. 4. Рыо-дэ-Жанейра. Хібары беспрацоўных. 5. К. Партынары. Галава індыянкі. Малюнак. 1940. 6. А. Э. Рэйдзі. Ансамбль будынкаў на ўзгорку Педрэгулью ў Рыо-дэ-Жанейра. 1950—52.





парт. школа імя К. Маркса і інш. ВНУ. Музей пям. гісторыі. Дзярж. музеі, культ.-гістар. музей г. Берліна і інш., б-кі (Ням. дзярж. б-ка), тэатры (Дзярж. оперны т-р, т-р імя Горкага, «Берлінер ансамбль» і інш.), стадыёны. Ёсць метро. Ін. гл. на ўклейцы.

Літ.: Lange A. Berlin, Hauptstadt der DDR, Leipzig, 1969; Berlin — Hauptstadt der DDR. Berlin, 1965; Baar L. Die Berliner Industrie in der industriellen Revolution. Berlin, 1966.

БЕРЛІН ЗАХОДНІ (West-Berlin), тэрыторыя на зямлі ГДР. Пл. 480,98 *км*², нас. 2,15 млн. чал. (1968). Б. З.— асобная палітычная адзінка. Вышэйшы орган улады — палата дэпутатаў, якая выбіраецца на 4 гады. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе сенат (урад), які выбіраецца палатай дэпутатаў. Сенат узначальваецца бургамістрам. Органы ўлады Б. З. падкантрольныя вайсковай адміністрацыі акупацыйных улад.

Кіруючыя колы ФРГ беспадстаўна прэтэндуюць на Б. З. Пры патуранні міжнар. імперыялісг. колаў ФРГ шырока пранікае ў паліт., эканам. і культурнае жыццё Б. З., выкарыстоўвае яго для варожай дзейнасці і правакацый супраць ГДР і інш. сацыялісг. краін. 17.6.1953 з тэр. Б. З. была зроблена спроба арганізаваць контррэвалюцыйны путч у сталіцы ГДР. Сав. Саюз, ГДР і інш. сацыялісг. краіны паслядоўна выступаюць супраць незаконных дамаганняў ФРГ на Б. З. У Б. З. дзейнічаюць: Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (засн. ў 1945, больш за 35 тыс. чл.); Хрысціянска-дэмакратычны саюз (засн. ў 1945, 8,9 тыс. чл.); Свабодная дэмакратычная партыя (засн. ў 1949, 1,5 тыс. чл.); Нацыянал-дэмакратычная партыя (філіял аднайменнай заходнегерм. неанацысцкай партыі, утворана ў 1967, каля 500 чл.); Сацыялістычная адзіная партыя Заходняга Берліна (да 1969 САПГ-Заходні Берлін; засн. ў 1946, марксісцка-ленінская партыя, каля 5 тыс. чл., старшыня Г. Данеліус).

Б. З.— вялікі прамысл. раён. Развіты машынабудаванне, эл.-тэхн., тэкст., харч., швейная прамысловасць. Найважнейшыя прадпр. належаць манаполіям і дзяржаве ФРГ, а таксама замежнаму, пераважна амер., капіталу: эл.-тэхн. прадпрыемствы — канцэрнам ФРГ Сіменс і АЭГ, амер. трэсту ІТТ; маш.-буд. прадпрыемствы — канцэрнам Гёша, Кванта, зах.-ням. дзяржаўнаму канцэрну Зальцгітэр. Хранічны дэфіцыт бюджэту Б. З. выкліканы непрадукцыйнымі выдаткамі на правядзенне палітыкі «франтавога горада», пазнімі тэмпамі эканам. развіцця, абумоўленымі ізаляцыяй ад ГДР і інш. суседніх краін, пасіўным гандлёвым і плацежным балансам, пакрываецца штогадовымі вялікімі датацыямі з бюджэту ФРГ. Грашовая адзінка — зах.-ням. марка.

Аднаўленне і забудова горада вядуцца несістэматычна, часта з рэкламных або паліт. меркаванняў (аднаўленне рэйхстага). Гістар. цэнтр забудоўваецца слаба, новы фарміруецца на вул. Курфюрстэндам. Значныя пабудовы: т-р Шылера (1949—50), Амер. мемарыяльная б-ка (1952—54), зала Кангрэсхале (1957), Нац. галерэя (1968) і інш. У Б. З. 8 ВНУ, у т. л. ун-т; алімпійскі стадыён і інш. спарт. збудаванні, заалагічны сад; Дзярж. музей у Далеме.

У Б. З. выдаюцца газеты «Berliner Morgenpost» («Берлінская раніцняя пошта»), «Berliner Stimme» («Голас Берліна»), «Der Tagesspiegel» («Штодзённае люстра»), «Telegraf» («Тэлеграф»), «Der Abend» («Вечар») і інш. перыяд. выданні. Бульварныя газеты «Bild-Zeitung» («Ілюстраваная газета») і «Nachtdepesche» («Начная тэлеграма») маюць адкрыта нацыяналістычны, антыкамуністычны кірунак. Працуюць 3 радыёстанцыі: PIAC (з 1946, пад кантролем ЗША), «Свабодны Берлін» (з 1953, мае тэлевізійнае адда., пад кантролем сената), AFN (з 1945, радыёстанцыя амер. войск).

БЕРЛІНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1945 (16.4—8.5), наступальная аперацыя 1-га Беларускага (Маршал Сав. Саюза Г. К. *Жукаў*), 2-га Беларускага (Маршал Сав. Саюза К. К. *Ракасоўскі*) і 1-га Украінскага (Маршал Сав. Саюза І. С. *Конеў*) франтоў, якая прывяла да авалодання Берлінам, выхаду сав. войск на р. Эльба і завяршыла разгром ням.-фаш. армій у Вял. Айч. вайну. Да канца сак. 1945 сав. войскі разбілі найбольш буйныя групоўкі ням.-фаш. войск ва Усх. Прусіі, Польшчы, Усх. Памераніі, Венгрыі і выйшлі шырокім фронтам да р. Одэр (Одра) і Нэйсе. Сціснутая з У, Пд і Пн Сав. арміяй, з З — войскамі саюзнікаў, фаш. Германія мабілізавала апошнія рэсурсы, каб утрымаць абарону па Одэры і Нэйсе, а калі яе прарвуць сав. войскі — здаць Берлін амерыканцам і англічанам. На подступах да Берліна ням. камандаванне стварыла глыбокаэшаланіраваную абарону да 100 *км* у глыбіню з трыма абводамі вакол сталіцы і 9 сектарамі абароны ў горадзе. Для абароны Берліна з усходу былі сканцэнтраваны групы армій «Вісла» (ген.-палк. Г. Хейнрыцы) і «Цэнтр» (ген.-фельдмаршал Ф. Шэрнер), у якіх было 1 млн. чал.; 85 дывізій (з іх 4 танкавыя і 10 матарызаваных), 37 асобных палкоў, 98 асобных батальёнаў і інш. Акрамя таго, гітлераўцы сфарміравалі 200 батальёнаў апалчэнцаў, т. зв. фольксштурму, рэзерв гал. камандавання — 8 дывізій. Сав. камандаванне на фронце ў 400 *км* ад Шчэціна да Гёрліца сканцэнтравала 19 агульнавайсковых, 7 танкавых і 4 паветр. арміі (2,5 млн. чал., 41 600 гармат і мінамётаў, 6250 танкаў і самаходна-артыл. устаноўак, 7500 самалётаў). Перавага над праціўнікам складала ў людзях 2,5 : 1, артылерыі 4 : 1, танках і самаходна-артыл. устаноўках 4,1 : 1, авіяцыі 2,3 : 1. У Б. а. ўдзельнічалі частка Балтыйскага флоту і *Дняпроўская ваенная флатылія*, 1-я і 2-я арміі Войска Польскага.


Б. а. пачалася 16 крас. ў 5 гадзін раніцы. Войскі 1-га Бел. фронту паносілі галоўны ўдар з Кюстрынскага плацдарма. У палосе атакі сав. пяхоты поле бою асвятлялі зенітныя пражэктары. К канцу дня прарваны 2 палосы абароны. Адначасова ў напрамку г. Котбуса і Пд Берліна наступалі войскі 1-га Укр. фронту. Яны фарсіравалі

р. Нэйсе і Шпрэе. Войскі 2-га Бел. фронту вялі баі на Пн ад Берліна і ў прыморскай палосе і раёне Шчэціна. Упартае супраціўленне ворага на Одэры і Нэйсе было зламана, і 23 крас. войскі 1-га Бел. і 1-га Укр. франтоў уварваліся ў Берлін. 25 крас. ташкавыя злучэнні ў раёне Кетцын замкнулі кола акружэння вакол Берліна, разарваўшы фронт ням.-фаш. войск. 26 крас. сав. войскі пачалі агульны штурм Берліна, 30 крас. авалодалі асноўным пунктам цэнтр. сектара абароны — рэйхстагам, над якім залунаў чырвоны Сцяг Перамогі. 2 мая ў 15 гадзін супраціўленне берлінскага гарнізона спынілася. Войскі 1-га Бел. і 1-га Укр. франтоў сустрэліся на Эльбе з амер. войскамі, а войскі 2-га Бел. фронту выйшлі да Вісмарскай бухты, дзе сустрэліся з англійскімі войскамі.

У ходзе Б. а. разбіта больш за 90 дывізій, узята ў палон 480 тыс. салдатаў і афіцэраў праціўніка, захоплена больш за 1500 танкаў і штурмавых гармат, 4500 самалётаў, 10 917 гармат і мінамётаў і інш. 8.5.1945 прадстаўнікі вышэйшага ням. камандавання падпісалі акт пра безагаворачную капітуляцыю Германіі. За мужнасць і гераізм каля 600 сав. воінам прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Медалём «За ўзяцце Берліна» ўзнаг. 1082 тыс. чал.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—1945, т. 5, М., 1963; Великая Отечественная война Советского Союза. Краткая история, М., 1967; История военного искусства, т. 2, М., 1963; Тельпуховский Б. С. Великая Отечественная война Советского Союза 1941—1945, М., 1959; Штеменко С. М. Генеральный штаб в годы войны, М., 1968; Жуков Г. К. Воспоминания и размышления, М., 1969.

БЕРЛІНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ 1884—85 па пытаннях каланіяльных уладанняў у Афрыцы. Склікана па ініцыятыве Германіі, каб перашкодзіць Вялікабрытаніі і Партугаліі захапіць зах.-афр. ўзбярэжжа, у т. л. вусце р. Конга. Удзельнікі — Аўстра-Венгрыя, Бельгія, Вялікабрытанія, Германія, Данія, ЗША, Іспанія, Італія, Нідэрланды, Партугалія, Расія, Турцыя, Францыя і Швецыя — фармальна прызналі Конга «свабоднай дзяржавай» на чале з бельг. каралём Леапольдам II (акрамя Бельгіі, права эксплуатаваць Конга атрымалі і інш. дзяржавы), вызначылі парадак набыцця «незанятых афр. зямель», удакладнілі граніцы партуг. калоній Анголы, фактычна адобрылі захопы Францыі ў Экватар. Афрыцы.



БЕРЛІНСКІ ПАКТ 1940, пакт аб ваенным саюзе, падпісаны 27 верасня ў Берліне гітлераўскай Германіяй, Італіяй і Японіяй. Прадугледжваў падзел свету паміж саюзнікамі, быў этапам у падрыхтоўцы агрэсіі супраць СССР. Бакі пагадзіліся, каб Германія і Італія ўсталявалі «новы парадак» у Еўропе, Японія — у Азіі, дамовіліся пра ўзаемадапамогу ў паліт., эканам. і ваен. галінах. Да Б. п. далучыліся Іспанія, Тайланд, Фінляндыя, залежныя ад Германіі бурж. ўрады Венгрыі, Румыніі, Славакіі, Балгарыі, Югаславіі (27.3.1941 урад Цветковіча быў скінуты, новы югасл. ўрад адмовіўся зацвердзіць акт пра далучэнне), марыянет. «ўрады» Маньчжоў-Го, Харватыі, створаны Японіяй на тэр. акупаванага Кітая «ўрад» Ван Цзін-вэя. Б. п. страціў значэнне ў выніку паражэння фаш. дзяржаў у 2-й сусв. вайне. Гл. таксама *«Вось Берлін — Рым»* і *«Антыкамінтэрнаўскі пакт»*.

Літ.: Израэлян В. Л. и Кутаков Л. Н. Дипломатия агрессоров, М., 1967, с. 66—142.

БЕРЛІНСКІ УНІВЕРСІТЭТ імя Гумбальта, адзін з найбуйнейшых універсітэтаў ГДР. Засн. ў 1809 у Берліне (адкрыўся ў 1810). У першыя гады ун-там кіраваў ням. вучоны-філолаг Вільгельм Гумбальт, у той час міністр асветы Прусіі. З Б. у. звязана дзейнасць вядомых вучоных філолагаў братоў Я. і В. Грым, мовазнаўца-санскрытолага Ф. Бопа, філосафаў Г. Гегеля, І. Фіхтэ, гісторыкаў Т. Момзена, Б. Нібура, патолагаанатама Р. Вірхава, фізікаў Г. Гельмгольца, Г. Кірхгофа і інш. У 1836—41 у ун-це вучыўся К. Маркс. У канцы 19 — пач. 20 ст. Б. у. быў адным з буйных цэнтраў навукі. У ім працавалі выдатныя фізікі А. Эйнштэйн, Э. Шродынгер, М. Планк, В. Нернст. У гады фаш. дыктатуры многія прафесары Б. у. эмігравалі з Германіі. У 1966/67 навуч. г. 9 ф-таў: філасофскі, прыродазнаўча-матэм., юрыдычны, эканам., пед., тэалагічны, мед., ветэрынарны, с. гасп. і садоўніцтва; 1900 выкладчыкаў, 14 тыс. студэнтаў. У б-цы ун-та (засн. ў 1831) больш за 1700 тыс. тамоў.

БЕРМАН Іаан Андрэевіч (г. н. і см. невяд.), беларускі этнограф бурж.-ліберальнага кірунку 60—70-х г. 19 ст. Чл. Рускага геагр. т-ва. Працуючы свяшчэннікам Валожынскага прыходу Ашмянскага пав. Віленскай губ., вывучаў народныя абрады, вераванні і назіранні, звязаныя з нар. календаром, метэаралогіяй. Каштоўнасць прац Б. ў іх вялікім фактычным матэрыяле.

Тв.: Порядок народного времясчисления и праздничные обычаи в Северо-Западной Руси, Вильна, 1869; Наблюдения нашего северо-западного крестьянства относительно погоды и урожая, «Виленский вестник», 1870, № 130, 132; Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе, Виленской губернии, Ошмянского уезда, СПб., 1874; Чаровники и знахари западнорусского простонародья, «Виленский вестник», 1903, № 152, 158, 160, 164.

БЕРМУДСКІЯ АСТРАВЫ (Bermuda), астравы ў Атлантычным ак., за 930 *км* на У ад Паўн. Амерыкі. З 1684 калонія Вялікабрытаніі. Пл. 53 *км*², нас. 52 тыс. чал. (1969), пераважна негры. Адм. ц. Гамільтан на в-ве Бермуда. А-вы адкрыў Х. Бермудэс у 1522.

А-вы каралавага паходжання. Іх больш за 300, толькі 20 абжыты, 7 з іх злучаны мастамі і чыгункаю. Клімат акіянічны, умерана вільготны. Т-ра паветра ад 16,7 (сакавік) да 26,7 °С (жнівень). Ападкаў больш за 1400 *мм* за год. Вырошчваюць раннюю агародніну, садавіну і кветкі. Рыбалоўства. Курорт і цэнтр турызму. Невялікія фармацэўтычныя, парфумныя, харч. прадпрыемствы. Ваен. базы ЗША.

БЕРН (Bern), сталіца Швейцарыі, адм. ц. аднайменнага кантона. У цэнтр. частцы краіны. Вузел чыгунак і шашэйных дарог. Аэрапорт. 251 тыс. ж. (1967, з прыгарадамі). Заснаваны ў 1191. У 1218 абвешчаны вольным імперскім горадам. У 1353 далучыўся да



Берн. Агульны выгляд.

швейц. канфедэрацыі. З 1848 сталіца Швейцарыі. У пач. 20 ст. адзін з цэнтраў рус. рэвалюц. эміграцыі. З вер. 1914 да лют. 1916 тут жыў і працаваў У. І. Ленін. 27.2—4.3.1915 у Б. праходзіла канферэнцыя замежных секцый РСДРП. Паліт. і фін. цэнтр краіны. Па ўзроўні прамысл. ўступае Цюрыху і Базелю. Прадпрыемствы вытворчасці машын (пераважна дакладнае машынабудаванне), шарсцяных, баваўняных і шаўковых тканін, навук. апаратуры і інструментаў, хімічных і фармацэўтычных тавараў, паліграфічнай прадукцыі.

Горад захаваў аблічча 18 ст. Помнікі архітэктуры: царква дамініканцаў (каля 1290), ратуша (пачата ў 1406, адноўлена ў 1942); сабор св. Вінцэнта (1421—1598, арх. М. Энзінгер, С. Гурдэр, Д. Гайнц; захаваліся вітражы 15 ст.); шматлікія гарадскія вароты (13—18 ст.); царква св. Духа (1722—29, арх. Н. Шыльдкнехт); багадзельня (1735—41); Корнхаўз (1711—16, арх. І. Дзюнц); палац Эрлахергоф (1752), атэль дэ Мюзік (1767—70) і Старая гаўптвахта (1767, абодва арх. Н. Шпрунглі); парламент (1852—1901, арх. Г. Аўэр). Ун-т, Нацыянальная б-ка, батанічны і заалагічны сады, музеі.

БЕРНАЛ (Bernal) Джон Дэсманд (н. 10.5. 1901), англійскі фізік, філосаф і грамадскі дзеяч. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1937), Балгарскай, Венгерскай, Польскай і Румынскай акадэмій навук, АН СССР (1958), прэзідэнт-выканаўца Сусветнага Савета Міру. Вядомы працамі ў галіне фізікі, даследаваў структуры вугляроду, металаў, вады, вітамінаў, бялкоў і інш. У 1933 стварыў т. зв. берналаўскую мадэль лёду, якая тлумачыць паводзіны вады на ўсіх яе злучэннях. Аўтар прац пра ролю і месца навукі ў жыцці грамадства. З пазіцый дыялект. матэрыялізму разглядае філас. значэнне навукі ў цэлым, супярэчлівасць яе развіцця пры капіталізме, пастаянны прагрэс пры сацыялізме. Творы Б. — значны ўклад у распрацоўку пы-



танняў пра ўзаемаадносіны навукі і грамадскага прагрэсу. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1953.

Тв.: Рус. пер.— Наука и общество, М., 1953; Мир без войны, М., 1960; Возникновение жизни, М., 1969.

Літ.: Рожанский И. Д., Дж. Д. Бернал. (К 50-летию со дня рождения), «Успехи физических наук», 1951, т. 45, в. 2.

БЕРНАР (Bernard) Клод (12.7.1813—10.2.1878), французскі фізіёлаг і патолаг. Чл. Парыжскай АН (1854). Вывучаў нармальную і паталагічную фізіялогію, в 1868 распрацоўваў пытанні агульнай фізіялогіі. Аўтар класічнага даследавання ролі падстраўнікавай залозы ў працэсе ператраўлення тлушчаў. Выявіў глікагенную функцыю печані (здольнасць назапашваць глікаген з глюкозы крыві і ператвараць яго зноў у глюкозу); даказаў, што цэнтры вугляводнага абмену знаходзяцца ў прадаўгаватым мозгу; адкрыў вазаматорную (сасударухальную) функцыю сімпатычнай нервовай сістэмы, яе сувязь з кровазваротам і цеплааддачай. Сфармуляваў палажэнне пра пастаянства ўнутранага асяроддзя арганізма. Вядомы працы Б. пра цеплаўтварэнне, эл. з'явы ў жывёльных тканках, па вывучэнні функцыі крыві. У лабараторыі Б. працавалі рус. вучоныя І. М. Сечанаў, І. Р. Тарханаў, П. В. Аўсянікаў.

Літ.: Карлик Л. Н. Клод Бернар, М., 1964.

БЕРНАР (Bernhardt) Сара (22.10.1844, Парыж — 26.3.1923), французская актрыса. З 1862 іграла ў розных парыжскіх т-рах. Мастацтва Б. было прыкладам тэхнічнай дасканаласці. Актрыса моцнага тэмпераменту, майстар тонкага сцэнічнага дыялогу. Асн. ролі: Маргарыта Гацье («Дама з камеліямі» А. Дзюма-сына), Гамлет, Ларэнзача, Арляня (аднайм. п'есы У. Шэкспіра, А. дэ Мюсэ, Э. Растана). З трупай шмат гастраліравала па Еўропе (у Расіі ў 1881, 1892, 1908) і Амерыцы.

Літ.: Кугель А. Театральные портреты, Л.—М., 1967, с. 320—327.

БЕРНАРДЗІНЦЫ (лац. bernardini), у Польшчы, Літве і на Беларусі манахі каталіцкага ордэна, які адгалінаваўся ад францысканцаў і меў больш строгі статут. Назву атрымалі ад імя рэфарматара францысканцаў Бернардзіна Сіенскага (1380—1444), у гонар якога названы першы ў Польшчы манастыр Б. у Кракаве (1453).

У Вял. кн. Літоўскае Б. праніклі з Польшчы ў 2-й пал. 15 ст. і з дапамогай маёмных каталікаў і дзяржавы хутка пашырылі сваю дзейнасць на ўсю тэрыторыю. Манастыры Б. васн. ў Львове (1460), Вільнюсе (1469), Гродне (1494), Полацку (1498), Будславе (1504), Нясвіжы (1594), у 17 ст. у Заслаўі, Мінску, Слоніме, Іўі, Друі, Брэсце, Слуцку, Валожыне, Магілёве, Мсціславе, Оршы, Віцебску, Глуску і інш. Жаночыя манастыры былі ў Гродне, Мінску, Слоніме, Брэсце і інш. Некат. манастыры і касцёлы Б.— выдатныя помнікі стылю барока на Беларусі (напр., у Гродне, Слоніме, Мінску, Друі).

Дзейнасць Б. накіроўвалася на ўмацаванне каталіцызму і феад. ладу. Пасля далучэння Беларусі да Расіі ўплыў Б. пачаў хутка падаць. У 1830 закрыты касцёлы і манастыры Б. у Брэсце, у 1832 у Оршы, Віцебску, Беразіне, Пінску, Мазыры, Глуску і інш. Большасць манастыроў закрыта ў сярэдзіне 19 ст.

А. А. Варанавічус. Вільнюс;
Э. К. Дарашэвіч. Мінск.

БЕРНАРДОНІ (Bernardoni) Джавані (Ян) Марыя (каля 1541—42, Кома — 1605), італьянскі архітэктар, прадстаўнік барока. Працаваў у Польшчы і на Беларусі. Будаваў касцёлы, манастыры і інш. будынкі (у Гданьску, Калішы, Познані, Любліне, Кракаве). У 1583 запрошаны кн. Радзівілам (Сіроткам) у Нясвіж, дзе працаваў да 1599. Удзельнічаў у першым этапе буд-ва замка (закладзены ў 1583), збудаваў комплекс езуіцкага касцёла (барочная купальная базіліка) і калегіума (абодва 1584—93 ці 1598). Гл. таксама *Нясвіжскі фарны касцёл, Нясвіжскі замак.*

БЕРНЕКЕР (Berneker) Эрых (3.2.1874—15.3.1937), нямецкі моваznавец-славіст. Акад. Польскай АН (1914). Праф. Пражскага (1902), з 1911 Вроцлаўскага і Мюнхенскага ун-таў. Даследчык сінтаксісу і этымалогіі слав. моў. У 1922—29 рэдагаваў «Archiv für Slavische Philologie» («Архіў славянскай філалогіі»). Аўтар прац: «Пруская мова» (1896), «Парадак слоў у славянскіх мовах» (1900), «Славянская хрэстаматыя» (1902), «Граматыка рускай мовы» (6 выд., 1947), «Славянскі этымалагічны слоўнік» (1908—13).

БЕРНЕТ (Burnet) Франк (н. 3.9.1899), аўстралійскі вірусолаг. Праф. эксперым. медыцыны Мельбурнскага ун-та, дырэктар ін-та мед. даследаванняў (Вальтэра і Элізы Хол). Асн. працы па экалогіі вірусаў, механізме іх размнажэння, узаемаадносінах паміж вірусамі і іх гаспадарамі. Упершыню вывучыў узбуджальніка Q-ліхаманкі. У 1960 з П. Б. Медаварам атрымаў Нобелеўскую прэмію за даследаванні набытай імуналагічнай устойлівасці.

Тв.: Principles of animal virology, New York, 1955; Viruses and man, 2 ed., [s. l.], 1955.

БЕРНІНІ (Bernini) Джавані (Джан) Ларэнца (7.12.1598, Неапаль — 28.11.1680), італьянскі архітэктар, скульптар і жывапісец барока. Вучыўся ў бацькі; працаваў пераважна ў Рыме, куды пераехаў каля 1605. З 1628 гал. архітэктар сабора св. Пятра (бронзавы балдахін, 1624—33; надмагілле папы Урбана VIII, 1639—46). Перад саборам стварыў грандыёзную, абкружаную калонадай, авальную ў плане плошчу (*м*) 340×
×240 (1657—63). Удзельнічаў у буд-ве палацаў Барберыні (з 1629), Мантэчыторыо (каля 1650), Квірынале (з 1656, усе ў Рыме). Створаныя Б. парадныя ўсходы Скала Рэджа (Ватыкан, 1663—66), абрамленыя калонадай, якая паступова звужаецца, што павялічвае перспектыўны эфект, і авальная ў плане ц. Сант-Андрэа аль Квірынале (1653—



58, Рым) вызначаюцца дынамічнасцю кампазіцыі, вострым проціпастаўленнем святла і цяню. Найб. значныя скульптурныя творы Б.: «Давід» (1623), «Апалон і Дафна» (1622—25), бюст Шыпіёне Баргезе (1632, усе ў Рыме), бюсты Франчэска I д'Эстэ (1650—51, Модэна), Людовіка XIV (1665, Версаль), «Экстаз св. Тэрэзы» (1644—52, алтар ц. Санта-Марыя дэла Віторыя, Рым). Стварыў мноства фантанаў у Рыме: Трытона на пл. Барберыні, 1637; Чатырох рэк на пл. Навона, 1648—51, і інш.

Літ.: Лившиц Н. А., Бернини, М., 1957; Аркин Д., Бернини-скульптор, у яго кн.: Образы скульптуры, М., 1961; Pane R. Bernini architetto, Venezia, 1953; Wittkower R. Gian Lorenzo Bernini. The sculptor of the Roman baroque, London, 1955.

Г. І. Апачынская. Масква.

БЕРНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РСДРП, гл. *Канферэнцыя замежных секцый РСДРП 1915.*

БЕРНУЛІ (Bernoulli), сям'я швейцарскіх вучоных, якая дала 11 матэматыкаў. З іх найбольш вядомыя Якаб, Іаган, Данііл, пляменнік Якаба і Іагана — Мікалай Б. (1687—1759), праф. матэматыкі ў Падуі і Базелі; сын Іагана — Мікалай Б. (1695—1726), праф. матэматыкі Пецярбургскай АН; пляменнік Данііла — Якаб Б. (1759—89), чл. Пецярбургскай АН, і інш.

Якаб Б. (27.12.1654—16.8.1705), праф. матэматыкі Базельскага ун-та (1687). Выкарыстаў метады дыферэнцыяльнага вылічэння Г. В. Лейбніца, каб вывучыць уласцівасці некаторых крывых. Разам з братам Іаганам паклаў пачатак варыяцыйнаму вылічэнню; даказаў тэарэму тэорыі імавернасцей (т. зв. тэарэму Б.).

Іаган Б. (27.7.1667—1.1.1748), брат Якаба Б., праф. матэматыкі Гронінгенскага (1695) і Базельскага (1705) ун-таў. Даў першы сістэматычны выклад дыферэнцыяльнага і інтэгральнага вылічэнняў. Правёў важныя даследаванні па механіцы; тэорыя ўдару, аналітычнае правіла раўнавагі, вучэнне пра жывую сілу (кінетычную энергію) і інш.

Данііл Б. (29.1.1700—17.3.1782), сын Іагана Б., чл. Пецярбургскай АН (1725—33), з 1733 праф. у Базелі па фізіялогіі і з 1750 па механіцы. Распрацаваў метад лікавага рашэння алг. ураўненняў з дапамогай зваротных радоў, законы механікі вадкіх і газападобных цэлаў. Гл. *Бернулі ўраўненне.*

Тв. І. Б.: Рус. пер.— Избранные сочинения по механике, М.—Л., 1937.

Тв. Д. Б.: Рус. пер.— Гидродинамика, или Записки о силах и движениях жидкостей, Л., 1959.

БЕРНУЛІ ЎРАЎНЁННЕ, ураўненне гідрадынамікі, якое звязвае велічыні ціску p, скорасці цячэння v і вышыні размяшчэння часцінак h у розных сячэннях струменя вадкасці.

Выведзена Д. Бернулі ў 1738. Для элементарнага струменя супольнай несціскальнай і ідэальнай вадкасці (якая цячэ без трэння) пры ўсталяваным цячэнні В. ў. мае выгляд: $p + \frac{\rho v^2}{2} + g\rho h = \text{const}$, дзе g — паскарэнне сілы цяжару, ρ — шчыльнасць вадкасці. Кожнае складаемае ўраўнення мае размернасць ціску: p — статычны, $g\rho h$ — вагавы, $\frac{\rho v^2}{2}$ — дынамічны ціск. В. ў. карыстаюцца пры

разліках трубаправодаў, помпаў, вырашэнні пытанняў фільтрацыі.

БЕРШТЭЙН Сяргей Натанавіч [22.2(5.3). 1880, Адэса — 26.10.1968], савецкі матэматык. Акад. АН СССР (1929). Асн. навук. працы па тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі прыбліжэння функцый многачленамі, тэорыі імавернасцей. Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.



Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М., 1952—64.

Літ.: Ахиезер Н. И. Академик С. Н. Бернштейн и его работы по конструктивной теории функций, Харьков, 1955; К семидесятилетию Сергея Натановича Бернштейна, «Известия АН СССР. Сер. математическая», 1950, т. 14, № 3.

БЕРСАН Станіслаў Ігнатавіч (1895, Варшава — 21.4.1919), удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З сям'і банкіра. Чл. Камуніст. партыі з кастр. 1917. У 1-ю сусв. вайну шафёр аўтамаб. каманды штаба галоўнакамандуючага Зах. фронту. З мая 1917 дэлегат, пазней нам. старшыні Мінскага Савета, камісар ВРК Зах. фронту. Чл. дэлегацыі ВРК па падпісанні ў в. Солы 20.11.1917 дагавору з нямецкім камандаваннем пра перамір'е. З ліст. 1917 парком па справах нацыянальнасцей Зах. вобласці і фронту. Стваральнік і рэдактар бальшавіцкай газ. «Prawda» («Праўда»), потым «Polska prawda» («Польская праўда»), чл. праўлення (бюро) Мінскай групы СДКПіЛ. Арганізоўваў польскія рэвалюц. батальёны для абароны заваёў Кастрычніка. З лют. 1919 парком Дзяржкантролю Літоўска-Беларускай ССР. Арыштаваны польскімі легіянерамі на чыг. ст. Нова-Вілейка. Расстраляны ў мяст. Рудаміна. Імем Б. названа вуліца ў Мінску.

Літ.: Хацкевич А. Ф. Польские интернационалисты в борьбе за власть Советов в Белоруссии, Мн., 1967; Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919—1920 гг.), Мн., 1962; Księga Polaków uczestników Rewolucji Październikowej 1917—1920. Biografie, Warszawa, 1967.

Я. Н. Шкляр. Мінск.

БЕРТАЛЕ (Berthollet) Клод Луі (9.11.1748—6.11.1822), французскі хімік, чл. Парыжскай АН (1780). У 1786—87 удзельнічаў у распрацоўцы новай хім. наменклатуры. У гады франц. бурж. рэвалюцыі канца 18 ст. арганізаваў вытв. салетры, парааху і сталі на патрэбы рэспублікі. Вызначыў хім. састаў аміяку (1785), сінільнай к-ты (1786) і інш. рэчываў. Распрацаваў спосаб бялення палатна, воску і паперы хлорам (1785) і спосаб атрымання хларату калію (берталетавай со-

лі), пітрыду серабра. Заснаваў вучэнне пра *раўнавагу хімічную*. Прадказаў існаванне хім. індывідуальных рэчываў пераменнага саставу, адкрытых у пач. 20 ст. М. С. *Курнаковым* і названых ім берталідамі.

Літ.: Старосельская-Никитина О. Очерки по истории науки и техники периода Французской буржуазной революции 1789—1794. М.—Л., 1946.

БЕРТЛО, Бертэло (Berthelot) П'ер Эжэн Марселен (25.10.1827—18.3.1907), французскі хімік і бурж. паліт. дзеяч. Чл. Парыжскай АН (1873), замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН (1876). Навук. працы па арган. хіміі, тэрмахіміі, аграхіміі і гісторыі хіміі. Сінтэзаваў арган. злучэнні — нафталін, бензол, фенол, злучэнні тлустага раду і інш. Вывучаў цеплыню рэакцый, хім. раўнавагу, дзеянне выбуховых рэчываў і значэнне вугляроду, вадароду і азоту ў раслінах. Сваімі працамі абвяргаў ідэаліст. вучэнне пра «жыццёвую сілу» (гл. *Віталізм*). Быў міністрам асветы і міністрам замежных спраў.

Літ.: Матиньон К. Труды и деятельность Марселена Бертело, «Успехи физических наук», 1928, т. 8, в. 1.

БЕРУТ (Bierut) Баляслаў (парт. псеўд. Томаш; 18.4.1892, Руры Езуіцкія каля Любліна — 12.3.1956), дзеяч польскага і міжнар. рабочага руху. З 1912 удзельнічаў у рэвалюц. барацьбе, быў чл. ППС-лявіцы. У кампартыі Польшчы з часу яе стварэння (снеж. 1918). У 1933 арыштаваны і прыгавораны да 7 гадоў турмы. У час 2-й сусв. вайны адзін з арганізатараў барацьбы польскага народа супраць гітлераўскай акупацыі. У 1941—43 у падполлі на тэр. Беларусі, часова акупаванай ням.-фаш. войскамі. У 1944 выбраны старшынёй *Краёвай Рады Народовай*. У 1947—52 прэзідэнт Польскай Рэспублікі, у 1952—54 старшыня Савета Міністраў. З снеж. 1948 старшыня ЦК ПАРП. З сак. 1954 першы сакратар ЦК ПАРП. Узначальваў польскую парт. дэлегацыю на XX з'ездзе КПСС.



Тв.: O partii, 2 wyd., Warszawa, 1954; O konstytucji Polskiej Rzeczypospolitej Ludowej.— Konstytucja Polskiej Rzeczypospolitej Ludowej, Warszawa, 1955.

БЕРЦЭЛІУС (Berzelius) Ёнс Якаб (20.8.1779—7.8.1848), шведскі хімік і мінералог. З 1808 чл. Стакгольмскай АН. У навук. працах развіваў атамістычную тэорыю М. В. Ламаносава; увёў сучаснае абазначэнне атамаў хім. элементаў; вызначыў паняцці алатропіі, ізамерыі, каталізу; адкрыў цэрый, селен і торый; упершыню атрымаў у свабодным стане крэмній, тантал, тытан і цырконій; прапагандаваў тэорыю радыкалаў і даследаваў вял. колькасць арган. злучэнняў. Прыхільнік ідэаліст. тэорыі «жыццёвай сілы» (гл. *Віталізм*).

Літ.: Соловьев Ю. И. и Куринной В. И. Якоб Берцелиус. Жизнь и деятельность, М., 1961.

БЕРШТЫ, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Котра і паўд. беразе Бярштоўскага воз. Цэнтр сельсавета і калгаса «Берштыі». За 44 *км* на ПнЗ ад Шчучына, 55 *км* ад Гродна, 21 *км* ад чыг. ст. Парэчча. 387 ж., двароў 140 (1970). Смалакурня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, адда. сувязі, 3 магазіны. Упершыню ў дакументах упамінаецца пад 1460. У 1496 тут адбыўся сейм Вял. кн. Літоўскага. У 1812 дзейнічаў партыз. атрад супраць франц. акупантаў; у 1920 — ваенна-рэвалюц. к-т. У Вял. Айч. вайну дзейнічаў партыз. атрад «Баявы». Помнік на магіле В. В. Аляксандрава — нам. камандзіра роты партыз. атрада «Камсамол Беларусі» партыз. брыгады імя К. Каліноўскага.

БЕРЫЛ (грэч. bēryllos), мінерал, алюмасілікат берылію $Be_3Al_2[Si_6O_{18}]$. Змяшчае 14,1% BeO, прымесі шчолачаў да 7%, часам Rb_2O, Cs_2O (да 3% у вараб'явіце). Крышталі прызматычныя гексаганальнай сістэмы. Колер ярка-зялёны *(ізумруд)*, блакітна-зялёны *(аквамарын)*, ружовы (цэзіевы берыл — вараб'явіт). Празрысты. Цв. 7,5—8; шчыльн. 2630—2910 *кг/м*³. Трапляецца ў гранітных пегматытах (крышталі з масай да 16 *т*), *грэйзенах*, крышталічных сланцах. Руда для вытв. берылію. Ізумруд і аквамарын — каштоўныя камяні. Радовішчы Б. ў СССР, Індыі, Калумбіі, ЗША, Бразіліі і інш.

БЕРЫЛІЕВЫЯ РУДЫ, прыродныя мінеральныя агрэгаты, якія змяшчаюць *берылій* у колькасцях, эканамічна выгадных для прамысл. здабычы з іх металу. Найважнейшыя рудныя мінералы: брамеліт BeO (98% BeO), *хрызаберыл*, *фенакіт*, бертрандыт $Be_4[Si_2O_7](OH)_2$ (да 35—42% BeO), *берыл*, гельвін, гентгельвін $Zn_4[BeSiO_4]_3S$ (12—13%), даналіт $Fe_4[BeSiO_4]_3S$ (12—15%) і інш. Яны складаюць першыя адзінкі працэнтаў мінер. агрэгата руды. Усе радовішчы Б. р. эндагеннага паходжання. Звязаны з пародамі пераважна кіслага саставу.

Паводле генетычных тыпаў вылучаюцца радовішчы наст. фармацый: *грэйзенаў*, *пегматытаў*, высокатэмпературнай кварцава-жыльнай, альбітытаў (у метасаматычна зменených гранітоідах — апагранітах), сярэдне- і нізкатэмпературнай гідратэрмальнай (у зменených кіслых эфузівах — ліпарытах і метамарфізаваных пясчана-сланцавых і карбанатных пародах).

Радовішчы Б. р. у СССР (Еўрап. ч. СССР, Сібір, Сярэд. Азія, Урал, Д. Усход, Казахстан), Бразіліі, КНР, ЗША, Індыі і інш.

Літ.: Некоторые типы пневматолито-гидротермальных месторождений бериллия, М., 1959; Беус А. А. Геохимия бериллия и генетические типы бериллиевых месторождений, М., 1960.

БЕРЫЛІЕВЫЯ СПЛАВЫ, металы, легіраваныя берыліем.

Найбольш выкарыстоўваюцца Б. с. на аснове медзі (берыліевыя бронзы) з наяўнасцю берылію да 2,5%. Трываласць ($\sigma_в$ да 130 *кг/мм*²) і цвёрдасць (да 410 *кг/мм*² паводле Брынелля) гэтых сплаваў, як у сталі; вызначаюцца пругкасцю (модуль пругкасці E = 13 000 *кг/мм*²), карозійнай устойлівасцю. Ідуць на выраб спружын, мембран, эл. кантактаў, а таксама шасцерняў высакаскорасных механізмаў. Нікелевыя сплавы з дамешкай 2—3% берылію пругкія, цвёрдыя і ўстойлівыя да павышанай т-ры. З іх вырабляюць дэталі газавых турбін, швейныя іголкі і інш. Невял. дабаўкі берылію да алюмініевых сплаваў паляпшаюць іх ліцейныя ўласцівасці, здрабняюць зерне металу, павялічваюць трываласць і пластычнасць. Магніевыя сплавы з дамешкай 0,01% берылію ўстойлівыя да карозіі ў вадзе і на паветры. Берыліевыя сталі і чыгуны маюць дробназярністую структуру, вызначаюцца гарачатрываласцю.

Літ.: Коронцевич В. К. Применение редких металлов в машиностроении. Обзор, М., 1961; Сонгина О. А. Редкие металлы, 3 изд., М., 1964.

П. А. Пархуціх. Мінск.

БЕРЫЛІЗАЦЫЯ, дыфузійнае насычэнне берыліем паверхні стальных вырабаў. Надае ім цвёрдасць, гарача- і зносаўстойлівасць і антыкаразійныя ўласцівасці. Пры Б. вырабы ў кантэйнеры з парашком берылію або фераберылію трымаюць у тэрмічнай печы пекалькі гадзін пры т-ры 1000—1100 °С. Глыбіня берылізаванага слою 0,15—0,45 *мм*.

БЕРЫЛІЙ (Beryllium), Be, хімічны элемент II групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 4, ат. м. 9,012. Адкрыты франц. вучоным Л. Вакленам у 1798. Мае адзін стабільны ізатоп ^{9}Be і пекалькі штучных радыеактыўных. У прыродзе Б. знаходзіцца $6 \cdot 10^{-4}$% па масе ў выглядзе мінералаў; гал. з іх *берыл*, празрыстыя афарбаваныя разнавіднасці якога — каштоўныя камяні. Б.— цвёрды і крохкі метал шэрага колеру, t пл. 1285 °С, t кіп. 2970 °С, шчыльн. 1850 *кг/м*³. Пры нармальных умовах устойлівы да дзеяння кісларoду і вады. Растварaецца ў кіслотах і шчолачах. Праяўляе валентнасць II. Пры награванні рэагуе з кіслародам, азотам, галагенамі і інш. простымі рэчывамі, з вадародам непасрэдна не ўзаемадзейнічае. Атрымліваюць Б. рознымі метадамі з берылу. Гал. галіна выкарыстання — *берыліевыя сплавы*, *берылізацыя*; у атамнай тэхніцы ўжываецца як замаруджвальнік, адбівальнік або крыніца нейтронаў. З яго робяць акенцы ў рэнтгенаўскіх трубках. Лятучыя злучэнні Б. таксічныя.

БЕРЫНГ (Bering) Вітус Іонасен (у дакументах часта — Іван Іванавіч; 1681—8.12.1741), рускі мараплавец. Выхадзец з Даніі. З 1703 афіцэр рускага флоту. Кіраўнік 1-й (1725—30) і 2-й (1733—43) Камчацкіх экспедыцый, у выніку якіх з А. І. Чырыкавым абследаваў берагі Камчаткі, Чукоткі, прайшоў праліў паміж Азіяй і Амерыкай, даслягнуў узбярэжжа Паўн. Амерыкі. У яго гонар названы мора, праліў, в-аў з групы Камандорскіх а-воў, на якім Б. памёр ад цынгі ў час вымушанай зімоўкі.

Літ.: Чуковский Н. Беринг, М., 1961 (Жизнь замечательных людей).

БЕРЫНГАВА МОРА, ускраінае мора Ціхага ак. Аддзелена ад акіяна Алеуцкімі і Камандорскімі а-вамі, абмывае берагі Азіі ад Чукоцкага п-ва да Камчаткі і Паўн. Амерыкі (Аляска). Пл. 2304 тыс. *км*². Паўн.-ўсх. частка — мацерыковая водмель з глыб. да 200 *м*; паўд.-зах.— глыбакаводная, да 4198 *м*. Залівы: Анадырскі, Алютарскі, Карагінскі, Нортан, Брыстольскі. Самыя вялікія а-вы: Св. Лаўрэнція, Карагінскі, Нунівак, Прыбылова.

Берагі моцна парэзаныя; усх.— нізінныя, зах.— пераважна гарыстыя. У Б. м. ўпадаюць рэкі Анадыр, Юкан. Клімат на Пн субарктычны, на Пд умераны. Т-ра паверхневых водаў у лютым на Пд 2, на астатняй тэр. ніжэй за —1 °С; у жніўні 5—6 на Пн і 9—10 °С на Пд. Салёнасць вады 32—32,5‰, на крайнім Пд 33, у некат. залівах да 30‰. Паверхневыя цячэнні ўтвараюць кругазварот супраць гадзіннікавай стрэлкі. Прамысл. значэнне маюць кіты, маржы, марскія коцікі, цюлені. З рыб: кета, гарбуша, чавыча, траска, кунджа, навага і інш. Порты: Правідзення і Берынгаўскі (СССР), Ном (ЗША).

Літ.: Шлямин В. А. Берингово море, М., 1958.

БЕРЫНГАЎ ПРАЛІЎ, паміж Чукоцкім п-вам (Паўн.-Усх. Сібір) і Аляскай (Паўн. Амерыка). Злучае Паўн. Ледавіты ак. (Чукоцкае м.) з Ціхім ак. (Берынгава м.). Даўж. праліва 60 *км*, шыр. 35—86 *км*, глыб. 42—70 *м*. З ліст. да чэрв. ўкрыты дрэйфуючымі льдамі. Праліў упершыню (1648) пройдзены казаком С. Дзяжнёвым, потым у 1728 рус. экспедыцыяй В. Берынга. Па Б. п. праходзіць граніца паміж СССР і ЗША.

БЕРЫТАШВІЛІ (Берытаў) Іван Саламонавіч [н. 29.12.1884 (10.1.1885), в. Веджыні Сігнахскага пав., Грузія], савецкі фізіёлаг. Акад. АН СССР (1939) і АН Груз. ССР (1941), правада. чл. АМН СССР (1944). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1910). У 1915—19 выкладчык Адэскага ун-та. З 1919 праф. Тбіліскага ун-та. Працы па мышачнай і нервовай фізіялогіі (гал. ч. фізіялогіі ц. н. с.) і электрафізіялогіі. Заснаваў першую эксперым. лабараторыю ў Грузіі, на базе якой створаны Ін-т фізіялогіі АН Груз. ССР (з 1935 імя Берыташвілі). Герой Сац. Працы (1964). Узнаг. ордэнам Леніна і 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга. Дзярж. прэмія СССР 1941.



Тв.: Индивидуально приобретенная деятельность центральной нервной системы, Тифлис, 1932; О нервных механизмах пространственной ориентации высших позвоночных животных, Тбилиси, 1959; Нервные механизмы поведения высших позвоночных животных, М., 1961; Общая физиология мышечной и нервной системы, т. 1—2, 3 изд., М., 1959—66; Память позвоночных животных, ее характеристика и происхождение, Тбилиси, 1968.

БЕСАРАБІЯ, гістарычная вобласць паміж Днястром, Прутам і ўзбярэжжам Чорнага мора.

У 10—11 ст. Б. ў складзе Кіеўскай Русі, з 12 ст.— Галіцка-Валынскага, з сярэдзіны 14 ст.— Малдаўскага княстваў, у 1513 захоплена туркамі. Паводле Бухарэсцкага міру 1812 Б. адышла да Расіі (Бесарабская губ.). У студз. 1918 акупавана Румыніяй. У выніку мірнага вырашэння канфлікту паміж СССР і Румыніяй у жн. 1940 асн. тэрыторыя Б. ўвайшла ў Малд. ССР, паўднёвая яе частка — у склад УССР.


БЕСЕДЗЬ, рака, левы прыток Сажа (бас. Дняпра). Даўж. 261 *км*, у БССР каля 205 *км*. Пачынаецца з балотнага масіву на тэр. Смаленскай вобл., цячэ ў Магілёўскай, Бранскай і Гомельскай абл. Рэльеф вадазбору (5460 *км*²) мяняецца ад плоскага да ўзгорыста-хвалістага, пашыраны супескі і суглінкі ледавіковага паходжання. Шыр. даліны Б. 100—2000 *м*, у ніжнім цячэнні да 3000 *м*. Шыр. рэчышча ў межані ад 15—25 *м* у верхнім цячэнні да 30—40 *м* (месцамі 100 *м*) у ніжнім. Гал. прытокі справа — Сураў, Жадунька, Дзяражня, Палуж, Каўпіта, злева — Трасцянка, Зубар, Стаўбунка. Ледастаў з пач. снежня да канца сакавіка. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады каля в. Свяцілавічы 25,4 *м*³/*сек*, у вусці 29 *м*³/*сек*. Б. мае меліярацыйна-лесасплаўнае значэнне. Суднаходная на працягу 78 *км* ад в. Казацкія Балсуны да вусця.

БЕСЕДЗЬ (Бесядзь), вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Беседзь. Цэнтр сельсавета. За 9 *км* на Пн ад Веткі, 31 *км* ад Гомеля, 30 *км* ад чыг. ст. Добруш, на шашы Ветка — Свяцілавічы. 389 ж., двароў 119 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 306 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Выяўлены 3 неалітычныя стаянкі: на правым беразе Беседзі, за 0,5 *км* на З ад вёскі; ва ўрочышчы Шубін, у міжрэччы Сажа і Беседзі, за 3 *км* вышэй вусця Беседзі; на курганах на ўсх. ускраіне вёскі.

БЕСЕЛЬ (Bessel) Фрыдрых Вільгельм (22.7.1784—17.3.1846), нямецкі астраном і геадэзіст. Чл. Берлінскай АН (з 1812). Распрацаваў тэорыю памылак астр. інструментаў. Упершыню (1838) вызначыў адлегласць да зоркі 61 Лебедзя. У 1844 тэарэтычна прадказаў існаванне спадарожнікаў у зорак Сірыус і Працыён. Выпайшаў прыладу для вымярэння геадэзічнага *базісу*. Шляхам градусных вымярэнняў вылічыў элементы зямнога эліпсоіда.

БЕСЕМЕРАЎСКІ ПРАЦЭС, 1) атрыманне сталі з вадкага чыгуну прадзіманнем яго паветрам або кіслародам у бесемераўскім канвертары. Спосаб прапанаваў англ. вынаходнік Г. Бесемер у 1855. Канвертар мае грушападобную форму (гл. рыс.). Кажух клёпаны, з стальных лістоў таўшч. 20—25 *мм*. Усярэдзіне яго футруюць (муруюць) вогнетрывалай цэглай (дынас); гэтым бесемераўскі канвертар адрозніваецца ад тамасаўскага, які футруецца даламітам.

Канвертары бываюць з ніжнім, бакавым і верхнім прадзіманнем. Працэс атрымання сталі ў канвертары з ніжнім прадзіманнем (мае адтуліны ў днішчы) такі: чыгун заліваюць у гарлавіну, для гэтага канвертар паварочваецца на 90° у гадзьмулкі канвертар ставяць вертыкальна. Праходзячы праз вадкі чыгун, кісларод паветра выпальвае крэмній, вуглярод, колькасць якіх неабходна паменшыць, а таксама марганец і жалеза. Пры Б. п. не выпальваюцца шкодныя прымесі (фосфар і сера), таму ўжываюць спец. чыгун з мінімальнай іх колькасцю (0,6—0,5% крэмнію, 0,6—0,9 марганцу, не больш за 0,07 фосфару і да 0,05% серы). У час прадзімання т-ра металу павышаецца, яна рэгулюецца дабаўкай жалезнай руды, лому (1—3 і 3—6% ад масы чыгуну). Ход Б. п. кантралююць па спектры полымя і фіз.-хім. метадамі. Перад выпускам сталь раскісляюць (памяншаюць колькасць кіслароду) алюмініем, ферасплавамі марганцу, крэмнію.



Канвертар:
1 — агульны выгляд; *2* — разрэз.

Шырокае развіццё атрымлівае Б. п. прадзіманнем чыгуну кіслародам. Паводле хім. саставу бесемераўская сталь, атрыманая ў кіслародным канвертары, раўнацэнная мартэнаўскай. З яе адліваюць слябы на ўстаноўцы бесперапыннай разліўкі металаў.

2) Асноўны спосаб атрымання чарнавой медзі. Робіцца ў канвертарах цыліндрычнай формы з бакавым прадзіманнем і гарыз. воссю вярчэння; футроўка з магнезіту. Расплаў сульфідаў медзі і жалеза (штэйн) заліваюць зверху праз гарлавіну. У час бесемеравання штэйна (прадзіманне паветрам) выпальваюць серу, а вокіслы жалеза з флюсам (спец. дабаўкі) утвараюць шлак. Для выпуску чарнавой медзі канвертар паварочваецца на 180° (гарлавінай уніз). Бесемераўскай медзь ідзе на агнявое або электралітычнае рафінаванне.

Літ.: Технология металлов и других конструкционных материалов, под ред. А. М. Дмитровича, Мн., 1968. *Л. С. Матусевіч.* Мінск.

БЕСКАНЕЧНА ВЯЛІКАЯ (у матэматыцы), пераменная велічыня, якая ў працэсе сваёй змены становіцца і ў далейшым астаецца па абсалютнай велічыні большай за любы наперад зададзены лік. Б. в. y вызначаецца як пераменная велічыня, *граніца* якой роўная бесканечнасці ($\lim y = \infty$). Сімвалам ∞ (чытаецца бесканечнасць) умоўна абазначаюць, што y ёсць Б. в. Напр., $\frac{1}{x}$, $\operatorname{ctg} x$, $\csc x$ — Б. в. пры $x \to 0$. У спец. раздзелах матэматыкі з сімвалам ∞ дапускаюцца дзеянні па правілах $\frac{1}{\infty} = 0$, $\frac{1}{0} = \infty$ і інш.

БЕСКАНЕЧНА МАЛАЯ, пераменная велічыня, якая ў працэсе змены становіцца і ў далейшым астаецца па абсалютнай велічыні меншай за любы наперад зададзены дадатны лік. Б. м. x вызначаецца як пераменная велічыня, *граніца* якой роўная 0 ($\lim x = 0$). Паняцце Б. м. ляжыць у аснове дыферэнцыяльнага і інтэгральнага вылічэнняў. Каб адрозніваць Б. м., якія маюць розную хуткасць імкнення да нуля, уводзіцца іх парадак. Дзве Б. м. x і y маюць аднолькавы парадак, калі граніца іх адносіны ёсць канечны лік не роўны 0 $\left(\lim \frac{y}{x} = a \neq 0\right)$. Калі $a = 1$, то Б. м. наз. эквівалентнымі. Напр., пры $x \to 0$ эквівалентныя: x, $\sin x$, $\operatorname{tg} x$, $\ln|1+x|$, $e^x - 1$. Калі $\lim \frac{y}{x} = 0$, то y ёсць Б. м. больш высокага парадку, чым x, а калі $\lim \frac{y}{x} = \infty$, то x больш высокага парадку, чым y. Паняцце Б. м. звязана з паняццем *бесканечна вялікая* велічыня. Калі x — Б. м., то $\frac{1}{x}$ — бесканечна вялікая велічыня, і наадварот, пры x бесканечна вялікай $\frac{1}{x}$ — Б. м.

Неабходна адрозніваць Б. м. ад велічынь мізэрна малых, якія з'яўляюцца зададзенымі пастаяннымі. Апошнія практычна малыя ў параўнанні з якімі-н. інш. велічынямі, напр. адлегласці ўнутры атама мізэрна малыя ў параўнанні з памерамі прадметаў, якія ў сваю чаргу мізэрна малыя адносна касмічных адлегласцей, і г. д. Але тут няма змены і магчымасці пераходу да нулявой граніцы. Першаадкрывальнікі вылічэння Б. м. (Б. Кавальеры, І. Ньютан, Г. В. Лейбніц і інш.) схільныя былі лічыць іх пастаяннымі, блізкімі да нуля, але не роўнымі 0 (актуальныя Б. м.). Такое разуменне Б. м. супярэчыць т. зв. прынцыпу Архімеда, паводле якога любая велічыня, паўторэная дастаткова вялікую колькасць разоў, перавышае любую наперад зададзеную велічыню. У сучаснай матэматыцы паняцце актуальнай Б. м. ужываецца толькі ў спец. геаметрычных даследаваннях па пытаннях незалежнасці аксіёмы непераперыўнасці.

Літ.: Бурбаки Н. Очерки по истории математики, пер. с франц., М., 1963 (Элементы математики). *Ф. Дз. Гахаў.* Мінск.

БЕСКАНЕЧНАЕ І КАНЕЧНАЕ, катэгорыі матэматыкі, філасофіі, фізікі і логікі. У навуцы склалася некалькі паняццяў пра Б. і к.

Ужо ў стараж.-грэч. навуцы адрозніваліся ўяўленні пра патэнцыяльна бесканечнае як працэс, што не мае канца, і пра актуальна бесканечнае як мноства, усе элементы якога пададзены адначасова і якое ўзнікае ў выніку «заканчэння» працэсу неабмежаванага паўтарэння пэўных дзеянняў (напр., дзялення ці складання). Канечнае разумелася або як працэс, хоць і не завершаны, але які можа быць завершаны (заканчваецца «ў прынцыпе»), або як мноства, пералік элементаў якога з'яўляецца канечным працэсам. У 19 ст. ў працах Б. Бальцана і асабліва Г. Кантара сфармулявана паняцце пра актуальна бесканечнае (мноства).

Мноства M наз. актуальна бесканечным, калі яно змяшчае такое падмноства M_1, што з'яўляецца правільнай (г. зн. якая не супадае з M) часткай M, але эквівалентнае мноству M (гэта азначае, што кожнаму элементу з M паводле пэўнага закону можна супаставіць адзіны элемент з M_1, і наадварот). Напр., мноства натуральных лікаў $\{n\}$ бесканечнае, бо яно змяшчае падмноства цотных лікаў $\{m\}$, якое не супадае з $\{n\}$, але эквівалентнае яму. Актуальна бесканечнае мноства не абавязкова не павінна мець канца ці пачатку; напр., мноства ўсіх сапраўдных лікаў ад 0 да 1 (уключна) мае і пачатак (лік 0) і канец (лік 1); мноства канечнае, калі яно не з'яўляецца бесканечным. Патэнцыяльная бесканечнасць звычайна разумеецца як патэнцыяльна ажыццявімы (г. зн. ажыццявімы незалежна ад матэрыяльных умоў) дыскрэтны працэс: калі пры ўмове патэнцыяльнай ажыццявімасці n-га кроку працэсу ажыццявімы яго $(n+1)$-ы крок, то не існуе патэнцыяльна неажыццявімага кроку гэтага працэсу.

Паняццямі актуальна Б. і к. карыстаюцца пры вызначэнні такіх паняццяў, як «шчыльнасць» і «неперарыўнасць» (пунктавых або лікавых мностваў); паняцце патэнцыяльна Б. і к. істотнае пры вызначэнні паняцця «(патэнцыяльна) бесканечна малой», «бесканечнасці часу» (гл. *Час*), «невычарпальнасці матэрыі» і інш. Патэнцыяльна Б. і к. служаць для характарыстыкі прасторы з боку працэсаў распаўсюджвання ўзаемадзеянняў; яны цесна звязаны з касмалагічнымі паняццямі незамкнутай (бесканечнай) і замкнутай (канечнай) прасторы, якія выкарыстоўваюцца ў розных «мадэлях» Сусвету (гл. *Касмалогія*). Паняцці актуальна Б. і к. ўжываюцца пры характарыстыцы прасторы з інш. боку — як прасторы, якая з'яўляецца мноствам матэрыяльных целаў, напр. зорак, планет, атамаў і г. д. Паняцці пра актуальна і патэнцыяльна Б. (аднаведна к.) выкарыстоўваюцца пры аналізе многіх матэм., фіз. і філ.-прабл., у прыватнасці пры аналізе цяжкасцей адлюстравання руху ў паняццях, пры абгрунтаванні матэм. аналізу і г. д. Паколькі Б. і к. з'яўляюцца паняццямі высокіх ступеняў абстракцыі, практычна выкарыстаць тэорыі, заснаваныя на якіх-н. паняццях бесканечнасці, можна толькі тады, калі навука ўмее не толькі ўводзіць гэтыя паняцці ў свае тэорыі, але і «выключаць» (папаўняць, канкрэтызаваць) іх пры дастасаваннях гэтых тэорый; такое «выключэнне» адбываецца, напр., пры рашэнні матэм. задач т. зв. інфінітэзімальнымі метадамі — метадамі дыферэнцыравання і інтэгравання, — калі рашэнне даводзіцца да лікавых вынікаў. Гл. таксама *Бесканечна вялікая*, *Бесканечна малая*.

Літ.: Мелюхин С. Т. Проблема конечного и бесконечного, М., 1958; Петров Ю. А. Логические проблемы абстракций бесконечности и осуществимости, М., 1967. *Ю. А. Пятроў.* Масква.

БЕСКАНЕЧНЫ ЗДАБЫТАК, граніца паслядоўнасці частковых здабыткаў $p_n = u_1 \times u_2 \dots u_n$ пры $n \to \infty$ $\left(p = \prod_{n=1}^{\infty} u_n\right)$. Б. з. сыходзіцца, калі граніца існуе і не роўная 0, і разыходзіцца, калі граніца не існуе ці роўная 0.


Для вручнасці даследавання ўмоў сыходнасці множнікі здабытка пішуць у выглядзе $u_n = (1 + v_n)$. Сыходнасць Б. з. раўназначная сыходнасці раду, складзенага з лагарыфмаў яго членаў, ці раду $\sum_{n=1}^{\infty} v_n$. Калі рад $\sum_{n=1}^{\infty} |v_n|$ сыходзіцца, то Б. з. сыходзіцца абсалютна (дапушчальна любая перастаноўка парадку множнікаў). Напр., Б. з. $\prod \left(1 + \frac{1}{n^{\alpha}}\right)$ сыходзіцца (і прытым абсалютна) пры $\alpha > 1$ і разыходзіцца пры $\alpha < 1$. Упершыню Б. з. сустрэўся пры вылічэнні ліку π. У 17 ст. Дж. Валіс даў найбольш простае раскладанне гэтага ліку: $\frac{\pi}{2} = \frac{2}{1} \cdot \frac{2}{3} \times \frac{4}{3} \cdot \frac{4}{5} \cdot \frac{6}{5} \dots = \prod_{n=1}^{\infty} \left[1 - \frac{(-1)^n}{n}\right]$. Б. з. карыстаюцца для запісу цэлых функцый, што з'яўляецца абагульненнем раскладання многачлена на множнікі паводле тэарэмы Безу. Напр., цэлая функцыя $\sin z$ з бесканечным мноствам каранёў у пунктах $n\pi$ ($n = 0, \pm 1, \pm 2, \dots$) можа быць раскла-

дзена ў Б. а. віду $\sin z = z \prod_{n=1}^{\infty} \left(1 - \frac{z^2}{n^2 \pi^2}\right)$, які сыходзіцца абсалютна для ўсіх значэнняў z.

Ф. Дз. Гахаў. Мінск.

БЕСКАНЕЧНЫ РАД, гл. *Рад.*

БЕСКАНТАКТАВАЕ КІРАВА́ННЕ электрапрывода́м, кіраванне з дапамогай лагічных элементаў без электрамагнітных рэле і кантактараў. Робіцца не разрывам эл. сувязей, а за кошт змены характарыстык дыёдаў, транзістараў, ферытаў, рэзістараў або велічыні маг. патоку. Ужываецца для камутацыі (уключэння, адключэння і пераключэння) электрапрывода, ртутнага выпрамніка і інш. Ажыццяўляецца пераключальнікамі ці блокамі з лагічнымі элементамі.



Бескантактавы пераключальнік ББК 201-24.

Пры Б. к. шырока карыстаюцца бескантактавымі пуцявымі пераключальнікамі ББК, распрацаванымі Мінскім спец. канструктарскім бюро аўтам. ліній. Аснова пераключальніка ББК — паўправадніковая схема кіроўнага генератара. Высокая надзейнасць і адчувальнасць, даўгавечнасць, незалежнасць параметраў ад мех. уздзеянняў, малыя габарыты і маса пераключальніка ББК абумовілі яго перавагу над кантактавымі пераключальнікамі і забяспечылі шырокае выкарыстанне Б. к. ў машынабудаванні, станкабудаванні, металургіі, дрэваапрацоўцы і інш. (асабліва пры неспрыяльных умовах навакольнага асяроддзя). Розныя віды пераключальнікаў ББК вырабляюцца на з-дзе эл. вырабаў у г. Лідзе.

Літ.: Ивенский Ю. Н. Некоторые вопросы разработки бесконтактных путевых переключателей, «Электротехника», 1966, № 11.

А. А. Фурэмс. Мінск.

БЕСКІН Ізраіль Саламонавіч [13(25).11.1895, Віцебск — 19.1.1964], Герой Сав. Саюза (1945), ген.-л. З рабочых. Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнічаў у ліквідацыі эсэраўска-кулацкіх мяцяжоў у Віцебскай і Смаленскай губ., у вызваленні Хабараўска, Валачаеўкі, Уладзівастока ад яп. акупантаў. У Айч. вайну падраздзяленні артылерыі, якімі камандаваў Б., удзельнічалі ў вызваленні Гомеля, Рэчыцы, Калінкавіч, Бабруйска. Камандуючы артылерыі 70-й арміі 2-га Бел. фронту Б. вызначыўся ў час прарыву абароны ворага на Одэры каля Шчэціна. Пасля вайны камандаваў артылерыяй ваеннай акругі.



БЕСПАЗВАНОЧНЫЯ (Invertebrata, Evertebrata), шматлікая група жывёл, якія не маюць ні хорды, ні пазваночніка. Да Б. належаць *прасцейшыя, губкі, кішачнаполасцевыя, чэрві, малюскі, членістаногія, ігласкурыя* і інш. Вядома каля 1 млн. 250 тыс. відаў, з іх каля 1 млн. відаў — *насякомыя.* Пашыраны на ўсім зямным шары. Жывуць на сушы, у глебе, у прэсных і марскіх вадаёмах.

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

БЕСПЕРАПЫННАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ, працэс вырабу прадукцыі, які ажыццяўляецца на прадпрыемствах без перапынкаў. Б. в. ўласцівыя кароткі вытворчы цыкл, механізацыя або аўтаматызацыя дапаможных і транспартных працэсаў, кругласутачная работа без перапынкаў у выхадныя і святочныя дні. Пры рамонце асн. агрэгатаў прадукцыю вырабляюць на рэзервовых.

БЕСПЕРАПЫННАЯ РАЗЛІЎКА МЕТАЛАЎ, спосаб ліцця, пры якім расплаўлены метал падаецца ў крышталізатар, цвярдзее і адтуль няспынна выцягваецца ў выглядзе злітка. Пашырана ў чорнай і каляровай металургіі для адліўкі зліткаў, пруткоў, палос, трубаў.




Схема ўстаноўкі для бесперапыннай разліўкі сталі:
1 — коўш; *2* — разліўчае прыстасаванне; *3* — крышталізатар; *4* — механізм рэзання; *5* — канвеер; *6* — кантавальнік; *7* — злітак; *8* — другаснае ахаладжэнне.

Робіцца на ўстаноўках, што складаюцца з заліўчага каўша, крышталізатара (ахалоджваецца вадой), механізмаў выцяжкі і рэзкі зліткаў, транспарцёра. Асн. частка ўстаноўкі — крышталізатар. Ён складаецца з утулкі (ліцце круглых зліткаў) і кажуха. Паміж сценкамі утулкі і кажуха пад ціскам працякае вада. Перад заліўкай крышталізатар закрываецца знізу паддонам. Расплаўлены метал падаецца з каўша або з печы праз размеркавальнае прыстасаванне ці па жолабе. Пасля ўтварэння з вадкага металу на сценцы крышталізатара цвёрдай скарынкі паўнай таўшчыні выцяжныя валкі перамяшчаюць злітак уніз. Раўнамерныя скорасці падачы вадкага металу, крышталізацыі і выцяжкі забяспечваюць пастаянны састаў, структуру і ўласцівасці па ўсёй даўжыні злітка. Каб працэс ліцця быў устойлівы, крышталізатар робіць зваротна-паступальны рух з амплітудай 5—20 *мм.* Скорасць ліцця звычайна 1—2 *м/мін.*

У параўнанні з паштучным ліццём Б. р. м. змяншае адходы і страты металу, затраты рабочай сілы, ліцейнай аснасткі і інструменту. На Магілёўскім металург. з-дзе імя Мяснікова ўпершыню ў СССР распрацаваны новы спосаб ліцця чыгунных трубаў у крышталізатарах з унутр. стрыжнем. Гл. *Трубаліцейная вытворчасць.*

Літ.: Войченко М. С., Рутес В. С. и Фульмахт В. В. Непрерывная разливка стали, М., 1961.

Я. І. Бельскі. Мінск.

БЕСПРАЦО́ЎЕ, уласцівая капіталістычнаму грамадству з'ява, калі частка пралетарскага насельніцтва не можа знайсці сабе работы, пазбаўлена сродкаў існавання, складае рэзервовую армію працы. Выклікаецца дзеяннем *усеагульнага закону капіталістычнага накаплення*, з'яўляецца прадуктам і ўмовай капіталіст. вытворчасці. Існуюць наст. формы Б.: цякучае (рабочыя, якія не маюць пастаяннай работы — то знаходзяць, то пазбаўляюцца яе); скрытае (збяднелыя дробныя таваравытворцы, пераважна сяляне — беднякі і батракі, якія пры першай магчымасці ідуць у горад); застойнае (рабочыя, якія доўгі час не маюць работы).

Б. ўзнікла ў пач. 19 ст. ў вакамічна развітых капіталіст. краінах Еўропы, асабліва ў Вялікабрытаніі. Знешне яно выглядае як неадпаведнасць паміж попытам капіталіст. рынку на рабочую сілу і яе прапановай. На самай справе Б. — вынік супярэчнасцей капіталіст. спосабу вытворчасці. З накапленнем капіталу і канцэнтрацыяй вытворчасці, тэхн. прагрэсам і ростам *арганічнай будовы капіталу* попыт на рабочую сілу падае, а прапанаванне яе з прычыны росту насельніцтва, збяднення сялян і інш. дробных вытворцаў, павышэння інтэнсіўнасці і выкарыстання жаночай і дзіцячай працы расце. Утвараецца *перанасяленне адноснае*, прамысловая рэзервовая армія. Наяўнасць лішніх рабочых рук на рынку працы забяспечвае капіталістам танную рабочую сілу, якую яны выкарыстоўваюць пры расшыранні вытворчасці, дазваляе павышаць інтэнсіўнасць працы, паніжаць заработную плату рабочых ніжэй вартасці рабочай сілы. Б. вядзе да жабрацтва мільёны людзей, якія страцілі работу, паніжае жыццёвы ўзровень рабочых, якія працуюць, бо на іх утрыманні знаходзяцца беспрацоўныя члены сям'і, робіць няўстойлівым становішча пралетарыяту. Пагроза Б. выкарыстоўваецца капіталістамі, каб задушыць актыўнасць рабочага класа ў эканам. і паліт. барацьбе.

Таму Б. — не толькі прадукт капіталіст. накаплення, але і неабходная ўмова існавання і развіцця капіталізму. «Лішняе насельніцтва... — зазначаў У. І. Ленін, — складае неабходную прыналежнасць капіталістычнай гаспадаркі, без якой яна не магла б ні існаваць, ні развівацца» (Тв., т. 2, с. 161—162).

У эпоху імперыялізму Б. становіцца масавым, хранічным у капіталіст. краінах. Асабліва вялікіх памераў яно дасягае ў гады эканам. крызісаў. У ЗША з 1929 да 1933 колькасць беспрацоўных павялічылася ў 8 разоў і дасягнула 12 млн. Ва ўмовах тэхн. прагрэсу Б. набывае новыя рысы. Механізацыя і аўтаматызацыя вытв. працэсаў робяць непатрэбнымі не толькі асобных рабочых, а нават цэлыя прафесіі. Пастаянны рост патрабаванняў да ўзроўню кваліфікацыі і адсутнасць планамернай падрыхтоўкі рабочых кадраў прыводзяць да таго, што структура попыту не адпавядае структуры прапанавання рабочай сілы. Асабліва цяжка Б. адбіваецца на лёсе маладых рабочых, якія не атрымалі кваліфікацыі, і рабочых старэйшых узростаў, неправучваць якіх капіталістам нявыгадна. У краінах «агульнага рынку» колькасць беспрацоўных павялічылася з 1176 тыс. у 1966 да 1476 тыс. у 1967, або на 36,2%. Гэта далёка не поўныя звесткі, таму што бурж. статыстыка, каб затушаваць супярэчнасці капіталізму, наўмысна зменшвае рэальныя паказчыкі Б. Але і наяўныя звесткі пра Б. (гл. табл.) сведчаць пра нездольнасць капіталізму выкарыстоўваць асн. прадукцыйную сілу грамадства — рабочых — і з'яўляюцца адным з паказчыкаў яго паразітызму і загнівання.

Колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у некаторых капіталістычных краінах (у тыс.)

	1960	1966	1967	1968 (у млн.)
ЗША	3852	2875	2975	3,1
Вялікабрытанія	393	391	599	0,7
Францыя	131	147	193	0,3
ФРГ	287	154	455	0,7
Італія	836	769	689	0,8
Японія	500	440	630	0,7

Рабочыя дарэвалюц. Беларусі цяжка пакутавалі ад Б. Паводле звестак афіц. статыстыкі царскай Расіі лішак рабочых рук у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. складаў да 40% усяго працаздольнага насельніцтва. За 50 гадоў перад 1-й сусв. вайной, шукаючы работу, пакінула радзіму каля 1400 тыс. беларусаў.

Б. і прычыны, што яго спараджаюць, цалкам знікаюць з перамогай сацыялізма. У першыя гады Сав. улады ў сувязі з разрухай, выкліканай сусв. вайной, замежнай інтэрвенцыяй і грамадз. вайной, у СССР было яшчэ значнае Б. Поўнасцю яно ліквідавана ў 1930.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, разд. 23; Энгельс Ф. Становішча рабочага класа ў Англіі, у кн.: Маркс К. і Энгельс Ф. Аб Англіі, Мн., 1954; Ленін У. І. Да характарыстыкі эканамічнага рамантызму, Тв., т. 2 (Полн. собр. соч., т. 2); яго ж. Імперыялізм як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900—1917, Мн., 1963; Супоницкий С. А., Буняев М. Ф. и Прибылева Г. Н. Цифры и факты о положении рабочего класса капиталистических стран, М., 1967; Проблемы безработицы в период общего кризиса капитализма, М., 1963; Безработица в странах развитого капитализма, «Мировая экономика и международные отношения», 1969, № 11; Мы и планета, 2 изд., М., 1969, с. 168.

Я. М. Раманенка. Мінск.

БЕСЧАРАПНЫЯ (Acrania), падтып хордавых жывёл. Памеры ад некалькіх *мм* да 5 *см.* У адрозненне ад чарапных усё цела падзелена на сегменты, галаўны аддзел не адасоблены, чэрапа няма, органы пачуццяў развіты слаба, сэрца адсутнічае (яго заменьвае брушны сасуд, які пульсуе). 2 сям.: Branchiostomatidae і Amphioxididae.

Пашыраны ў экватарыяльнай зоне Індыйскага, Ціхага і Атлантычнага акіянаў. Жывуць на вялікіх глыбінях. Найбольш вядомы прадстаўнік Б. — ланцэтнік. У СССР трапляецца ў Чорным моры. Яго развіццё (вывучаў А. А. Кавалеўскі, 1864) падобнае да развіцця пазваночных, таму ў эвалюц. радзе жывёл ланцэтнік займае прамежкавае становішча.


БЕТОН (франц. béton ад лац. bitumen горная смала), штучны будаўнічы матэрыял. Атрымліваецца пры зацвярдзенні сумесі клейкага матэрыялу (найчасцей цэменту), пяску, жвіру ці шчэбеню і вады. Сумесь перамешваецца ў *бетонамяшалках*, ушчыльняецца на *вібрапляцоўках* ці вібраінструментам. У форме ці ў апалубцы набывае патрэбную трываласць толькі пры дадатных т-рах у прыродных умовах каля месяца, на з-дах і палігонах пасля тэрмаапрацоўкі за 8—10 *гадз.* Пры адмоўных т-рах робяць пара- ці электрапрагрэў. Б. ідзе на бетонныя і жалезабетонныя канструкцыі і вырабы, асфальтабетон, а таксама збудаванні (напр., элеватары). Запаўняльнікі ўжываюцца прыродныя (пясок, жвір, пемза, туф, ракушачнік) і штучныя *(керамзіт, аглапарыт)*.

У залежнасці ад віду запаўняльніка і структуры матэрыялу (шчыльны ці порысты) адрозніваюць найцяжэйшы Б. (аб'ёмная маса больш за 2700 *кг/м*³) з запаўняльнікамі з барыду, жалезных рудаў ці металаў, які ўжываецца для аховы ад выпраменення на атамных эл. станцыях, у лабараторыях і інш. Цяжкі Б. (1800 *кг/м*³ і больш) мае запаўняльнікі з пяску, жвіру ці шчэбеню шчыльных горных парод. Пашыраны ў прамысловасці зборнага жалезабетону, зборнаманалітным і маналітным буд-ве. Лёгкі Б. (аб'ёмная маса менш за 1800 *кг/м*³) робіцца на порыстых запаўняльніках. Адрозніваецца малой цеплаправоднасцю і ўжываецца пераважна ў *агараджальных канструкцыях*. Асабліва лёгкі Б. (аб'ёмная маса менш за 700 *кг/м*³) — цеплаізаляцыйны матэрыял (ячэісты Б., перлітабетон і інш.). Ёсць спец. віды Б.: гідратэхнічны, хімічна ўстойлівы, гарачатрывалы, дэкаратыўны. Фармуюць вырабы з Б. і ўшчыльняюць бетонную сумесь вібраваннем (сумесь з адносна малой колькасцю вады), цэнтрыфугаваннем (выцв. жалезабетонных трубаў), вібравакуумаваннем (сумесь з адносна вялікай колькасцю вады), вібрапрасаваннем (танкасценныя канструкцыі). Асноўная ўласцівасць Б.— трываласць пры сцісканні (вызначае яго марку) — залежыць ад якасці клейкага матэрыялу, водацементавых адносін, ад шчыльнасці запаўняльніка і самога Б. Мяжа трываласці пры сцісканні (марка Б.) 50—800 *кг/см*². В. шырока ўжываецца ў буд-ве. На Беларусі пашыраны таксама аглапарытабетон.

Літ.: Воробьев В. А. Строительные материалы, 4 изд., М., 1967; Строительные материалы, под ред. Б. Г. Скрамтаева, 6 изд., М., 1954; Десов А. Е. Вибрированный бетон, М., 1956; Ахвердов И. Н. Высокопрочный бетон, М., 1961; Миронов С. А. и Малинина Л. А. Ускоренне твердения бетона, 2 изд., М., 1964; Ахвердов И. Н. и Шалимо М. А. Ультразвуковое вибрирование в технологии бетона, М., 1969.


І. М. Ахвердаў. Мінск.

БЕТОНАМЯШАЛКА, машына для нарыхтоўкі бетоннай сумесі *(бетону)*. Складаецца са змяшальнага барабана, які круціцца ад электрарухавіка, і механізма загрузкі і выгрузкі. Б. бываюць перыядычнага і бесперапыннага дзеяння, са свабодным ці прымусовым перамешваннем сумесі, стацыянарныя (ёмістасцю да 4500 *л*) і перасоўныя (да 250 *л*); ёсць аўтабетонамяшалкі (да 3500 *л*), у якіх бетон атрымліваюць у час руху аўтамабіля.



Бетонамяшалка перыядычнага дзеяння.

БЕТОННЫ ЗАВОД, комплекс машын, механізмаў і збудаванняў для нарыхтоўкі бетоннай сумесі *(бетону)*. Звычайна Б. з. маюць склады, транспартны цэх, дазіровачны і змешвальныя цэхі, лабараторыю. Бываюць стацыянарныя, інвентарныя (зборна-разборныя) і перасоўныя Б. з. Размяшчаюцца на вял. будоўлях, на з-дах жалезабетонных вырабаў, а таксама абслугоўваюць будоўлі пэўнага раёна. Атрымалі пашырэнне Б. з-аўтаматы.



Схематычны разрэз аўтаматызаванага бетоннага завода: *1* — склад запаўняльнікаў; *2* — дазатары; *3* — транспарцёр; *4* — бетонамяшалка; *5* — склад цэменту; *6* — раздатачны бункер.

Трэст Аргтэхбуд Мін-ва прамысловага буд-ва БССР распрацаваў праект бетонарастворнага з-да, на якім увесь тэхнал. працэс нарыхтоўкі бетоннай сумесі і растворaў аўтаматызаваны. Запаўняльнікі (пясок і шчэбень) падвозяцца да прыёмнага бункера, адтуль па стужкавым канвееры падаюцца ў размеркавальныя аддзяленні склада, а потым у шэсць адсекаў у залежнасці ад фракцыі. З адсекаў яны самацёкам паступаюць у аўтам. дазатары; з іх порцыі запаўняльнікаў транспартуюцца ў бетонамяшалку, куды таксама паступае порцыя цэменту і вады. З бетонамяшалкі сумесь ідзе ў раздатачны бункер, потым у кузаў аўтамабіля. Усім тэхнал. працэсам кіруюць з аднаго паста. Прадукцыйнасць такога з-да 150 тыс. *м*³ за год; ёмістасць склада 2100 *м*³; запланаваная магутнасць 150 *кат.* З-д абслугоўваюць 4 чал. Аўтаматызаваныя бетонарастворныя з-ды ёсць у Мінску, Магілёве, Наваполацку, Салігорску.

А. У. Цярэшка. Мінск.

БЕТПАК-ДАЛА (Паўночны Галодны Стэп), пустыня ў Казахскай ССР, паміж р. Сарысу на З і воз. Балхаш на У. Пл. каля 75 тыс. *км*². Сярэдняя выш. 300—350 *м*. Зах. частка — гліністая раўніна з плоскімі водападзеламі і бяссцёкавымі ўпадзінамі; усх. частка — хвалістая раўніна з градамі ўзгоркаў і асобнымі гарамі (г. Джамбул, 974 *м*). Клімат рэзка кантынентальны. Ападкаў каля 200 *мм* за год. Расліннасць — палын, салянкі, па катлавінах тамарыкс, ціпчак, кавыль. Радовішчы кам. вугалю, металічных рудаў, гіпсу, мармуру. Ёсць падземныя воды.

БЕТХОВЕН (Beethoven) Людвіг ван [16(?; хрышчаны 17).12.1770, Бон — 26.3.1827], нямецкі кампазітар. З сям'і патомных прыдворных музыкантаў фламандскага паходжання. Першае публічнае выступленне Б. адбылося ў 1778. Важную ролю ў фарміраванні Б. як творчай асобы адыграў вядомы музыкант-асветнік К. Г. Нефе. За першыя 10 гадоў кампазітарскай дзейнасці Б. напісаў каля 50 твораў, у т. л. варыяцыі на марш Дрэслера (1882), 2 кантаты, 6 фп. санат, 3 фп. квартэты, песні. Вывучэнне антычнай л-ры і філасофіі, творчасці У. Шэкспіра, Ф. Г. Клопштака, І. В. Гётэ, Ф. Шылера зрабіла ўплыў на светапогляд кампазітара. Неад'емнымі рысамі асобы Б. былі свабадалюбства і паліт. радыкалізм. З захапленнем прыняўшы франц. рэвалюцыю 1789, Б. заставаўся верны яе ідэалам усё жыццё. У 1792 пераехаў у Вену. Сярод твораў, напісаных паміж 1795 і 1802, дзве сімфоніі (1800, 1802), тры фп. канцэрты, 20 фп. санат, балет «Стварэнні Праметэя», араторыя «Хрыстос на Маслічнай гары». Сувязі з эстэтыкай 18 ст. выявіліся ў выбары жанраў, нар.-песенным тэматызме і строга перыядычных, прапарцыянальна развітых муз. структурах. Разам з тым элементы драматызму і схільнасць да манумент. формаў адрозніваліраннія творы Б. ад музыкі яго папярэднікаў. Глухата, прагрэсіруючы, выклікала ў Б. душэўны крызіс (1802). Барацьба з хваробай і пераадоленне адчаю адбіліся на творчасці наступных гадоў. У рабоце над 3-й сімфоніяй («Гераічная», 1803—04) упершыню ў поўнай меры выявіўся сімфанізм як метад муз. кампазіцыі, які даваў магчымасць праз развіццё канфліктных вобразаў усебакова раскрыць ідэю перамогі чалавечай волі над фатальнымі сіламі. Гэтай кардынальнай ідэі бетховенскай творчасці прысвечаны таксама 5-я сімфонія (1805—08), уверцюры «Эгмант», «Карыялан», «Леанора» (№ 1—3), опера «Фідэліо» (1805), 4-ы і 5-ы фп. канцэрты, фп. саната № 23 («Апасіяната») і інш. Пасля 1815 у музыцы Б. пераважаюць філас. і лірыка-псіхалаг. матывы. Гэта выявілася ва «Урачыстай месе» (1823), у апошніх фп. сонатах (№ 28—32) і квартэтах. Вяршыняй творчасці кампазітара і найвышэйшым муз. увасабленнем гуманіст. ідэалаў сваёй эпохі стала 9-я сімфонія з фінальным хорам на словы оды Ф. Шылера «Да радасці» (d-moll ор. 125, 1824). Б. абагульніў дасягненні венскай класічнай школы і зрабіў велізарны ўплыў на мастацтва 19 ст., на ўсе асн. галіны муз. творчасці — вакальную лірыку (Ф. Шуберт), оперу (Р. Вагнер), тэатралізаваны праграмны інструменталізм (Г. Берліёз) і філас.-драм. сімфанізм (П. Чайкоўскі, І. Брамс, А. Брукнер, Г. Малер). Гуманіст. пафас, глыбіня і актуальнасць ідэй, няспынныя пошукі новага ў мастацтве Б. натхняюць перадавых музыкантаў 20 ст.



Літ. тв.: Письма, пер. В. Д. Корганова, СПб., 1904.

Літ.: Роллан Р. Собр. соч., [пер. з франц.], т. 2, М., 1954, т. 12, М., 1957; Эррио Э. Жизнь Бетховена, 3 изд., [пер. з франц.], М., 1968; Альшванг А. Людвиг ван Бетховен, 3 изд., М., 1966; Книга эскизов Бетховена за 1802—1803 годы. Исследование и расшифровка Н. Л. Фишмана, М., 1962; Rutz H. Ludwig van Beethoven. Dokumente seines Lebens und Schaffens, München, 1957; Nettl P. Beethoven Encyclopedia, New York, 1956.

Т. А. Шчарбакова. Мінск.

БЕТЭЛЬГЕЙЗЕ, Бетэйгейзе (α Арыёна), пераменная чырвоная зорка 1-й зорнай велічыні, з іншымі трыма зоркамі ўтварае галоўны контур сузор'я *Арыёна*. Б.— зорка-звышгігант: дыяметрам у 450 разоў большая за Сонца, усярэдзіне яе маглі б умясціцца арбіты ўсіх планет сонечнай сістэмы да Марса ўключна.

БЕХЕР (Becher) Іаганес Роберт (22.5.1891, Мюнхен — 11.10.1958), нямецкі паэт, грамадскі і дзяржаўны дзеяч ГДР. Чл. арганізацыі «Саюз Спартака» (1918), з 1919 у КПГ. З сям'і служачага. Вывучаў філасофію і філалогію ў Мюнхенскім, Іенскім і Берлінскім ун-тах. Першыя вершы надрукаваў у 1911. Ранія зб. «Распад і трыумф» (1914), «Да Еўропы» (1916), «У імя бога» (1921) напісаны ў духу экспрэсіянізму. Паступова паэт пераходзіць ад анархічнага бунтарства да свядомай абароны ідэй пралет. рэвалюцыі. Апяваў Кастр. рэв., ганьбіў імперыялісц. вайну. Пасля апублікавання антымілітар. і антыбурж. зб. вершаў «Труп на троне» (1925) і рамана «Люізіт, або Адзінал справядлівая вайна» (1926) герм. рэакцыя абвінаваціла Б. ў «падрыхтоўцы да дзяржаўнай здрады». Суд быў спынены з-за пратэсту сусв. грамадскасці (у т. л. М. Горкага, Р. Ралана, Б. Брэхта). У 1933 эмігрыраваў. З 1935 жыў у СССР, дзе ў 1935—45 рэдагаваў антыфаш. час. «Internationale Literatur» («Інтэрнацыянальная літаратура»), з 1943 працаваў у нац. камітэце «Свабодная Германія». Вярнуўшыся ў 1945 на радзіму, узначаліў рух прагрэс. інтэлігенцыі за буд-ва дэмакр. і сацыяліст. культуры. Чл. ЦК САПГ (з 1946), прэзідэнт Акадэміі мастацтваў ГДР (1953—56), міністр культуры ГДР (з 1954). Гал. тэма твораў перыяду эміграцыі — выкрыццё фаш. варварства. Глыбокі патрыятызм і інтэрнацыяналізм выявіліся ў зб. «Шукальнік шчасця і сем грахоў» (1938), «Падзянка Сталінграду» (1943). Паэтычнага майстэрства Б. дасягнуў у санетах, напоўніўшы традыц. форму новым гуманіст. зместам. Напісаў аўтабіягр. раман «Развітанне» (1940) і драму пра разгром гітлераўскіх войск пад Масквой «Зімняя бітва». Зб. «Аба-



рона паэзіі» (1952), «Паэтычная споведзь» (1954) і «Паэтычны прыцып» (1957) развіваюць тэорыю сацыялісг. рэалізму. За стварэнне нац. гімна ГДР і ўсю творчасць прысуджаны ў 1949 і 1950 Нац. прэміі імя І. В. Гётэ. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1952.


Тв.: Бел. пер. — (CH · Cl-CH)$_2$As (льюізіт), або Адзіная справядлівая вайна, Мн., 1931; [Асобныя творы] — у час. «Полымя», 1927, № 3—6, 1928, № 1—6, 9, 1953, № 7, 1966, № 5; рус. пер.— Избр. соч., М., 1961; Сонеты, М., 1960; Любовь моя, поэзия, М., 1965.

Літ.: Биркан П. Оружием слова. Эстетические взгляды и творчество П. Бехера, Л., 1959.

БЕХЗАД Кемаледзін (каля 1445, Герат — 1535 ці 36), мастак, прадстаўнік герацкай школы мініяцюры. Працаваў у Гераце (апошняя чвэрць 15 ст.), Бухары (пач. 16 ст.), Тэбрызе (пасля 1510). Ілюстраваў рукапісы «Бустан» Саадзі, «Зафар-намэ» Шараф-ад-дзіна Алі Іездзі, «Хамсэ» Нізамі і інш. Кампазіцыя мініяцюр вызначаецца шматпланавай будовай, дынамізмам дзеі, гармоніяй фарбаў. Пачынальнік партрэтнай мініяцюры; у партрэтах Султана-Хусейна і Шэйбані-хана намечаны рысы псіхалагічнай характарыстыкі.

БЕХЦЕРАВА МІКСТУРА, лякарства, якое заспакойвае цэнтральную нервовую сістэму. Змяшчае настой травы гарыцвету, бромісты натрый (або калій) і кадзеін. Прапанавана У. М. *Бехцеравым*. Ужываецца пры неўрастэніі, істэрыі, эпілепсіі, інш. хваробах нервовай сістэмы і ад бяссонніцы. Выпускаецца таксама ў драже.

БЕХЦЕРАЎ Уладзімір Міхайлавіч [20.1 (1.2).1857, в. Соралі Вяцкай губ.— 24.12. 1927], рускі неўрапатолаг, псіхіятр, псіхолаг і фізіёлаг. Праф. (1885). У 1878 скончыў Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію. Заснаваў першае ў Расіі т-ва неўрапатолагаў і псіхіятраў (1892), час. «Неврологический вестник» (1893). У 1908 арганізаваў Псіханеўралагічны ін-т і быў яго дырэктарам. У 1918 заснаваў ін-т па вывучэнні мозгу і псіхічнай дзейнасці. Стварыў вучэнне аб праводных шляхах спіннога і галаўнога мозгу, функцыянальнай анатоміі мозгу, адкрыў у ім новыя ядры, вызначыў анатама-фізіял. асновы раўнавагі і функцыі зрокавага бугра; распрацаваў аб'ектыўныя метады вывучэння нервова-псіхічнага развіцця дзяцей; апісаў дыягнастычныя рэфлексы і сімптомы. Абгрунтаваў асновы фізіятэрапіі і фармакалогіі, рэнтгенатэрапіі і псіхатэрапіі. Адзін з заснавальнікаў нейрахірургіі, спосабу спалучальна-рэфлекторнай тэрапіі неўрозаў, алкагалізму, эксперымент. псіхалогіі ў Расіі. У апошніх працах сцвярджаў механістычны кірунак у псіхалогіі, які назваў рэфлексалогіяй.



Тв.: Избр. произв., М., 1954.

Літ.: Мясищев В. Н., В. М. Бехтерев — замечательный ученый, врач, педагог, общественный деятель, Киров, 1956.

БЕЧУАНАЛЕНД, былы пратэктарат Вялікабрытаніі. З 30.9.1966 незалежная дзяржава *Батсвана*.

БЕЧЫ, гарадзішча балотнага тыпу мілаградскай (7—3 ст. да н. э.) і зарубінецкай (3 ст. да н. э.— 1 ст. н. э.) культур. Знаходзіцца за 13 *км* на У ад Турава ў лясным урочышчы паміж р. Прыпяць і Сцвіга. Самае вялікае на Беларусі гарадзішча (9,5 *га*). Мае дзве раздзеленыя валам пляцоўкі, умацаваныя агульным валам даўжынёй 1410 *м*. Б. не былі заселены чалавекам і, пэўна, у стараж. часы з'яўляліся гарадзішчам-сховішчам жыхароў навакольных паселішчаў.

Літ.: Поболь Л. Д. Древности Туровщины, Мн., 1969. *Л. Д. Побаль.*

БЕШАНКОВІЦКІ ПАЛАЦ, помнік архітэктуры класіцызму. Заложаны ў 70-я г. 18 ст. ў *Бешанковічах* (Віцебская вобл.). П-падобны ў плане, палац мае тры ўзаемазвязаныя карпусы: двухпавярховы цэнтральны, які выдаецца наперад (тут былі залы і асн. пакоі), і бакавыя аднапавярховыя флігелі. Фасад без традыцыйнага порціка, вырашаны плоскасна. Дэкор сціплы: ажурны балкон, простыя карнізы, неглыбокія ніпы. Да палаца падступае парк з вадаёмам.

Літ.: Чантурия В. А. Архитектура Белоруссии конца XVIII — начала XIX века, Мн., 1962, с. 82—85.

БЕШАНКОВІЦКІ РАЁН, у складзе Віцебскай вобл. Размешчаны па абодвух баках Зах. Дзвіны. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,4 тыс. *км*^{2}. Нас. 37,8 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 11 сельсаветаў; 2 гар. пас.: Бешанковічы — адм. ц. раёна і Ула.

Паверхня раёна пераважна раўнінная, на Пд Чашніцкая раўніна, на Пн Полацкая нізіна і адгор'і Невельска-Гарадоцкага ўзвышша. Сярэдняя выш. 140—160 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: радовішча торфу Луг-Ухле — 1,9 млн. *т*, 3 радовішчы цагельных гліпаў — 1,1 млн. *м*^{3} (у т. л. радовішча Бачэйкава — 0,8 млн. *м*^{3}). Сярэдняя т-ра студз. ад —7,0 да —7,5 °С, ліп. 17,5—18,0 °С. Ападкаў 630 *мм* за год. Вегет. перыяд 190 дзён. У раёне цякуць Зах. Дзвіна і яе левыя прытокі: Ула з Свячанкай, Крывінка з Бярозкай. Азёры: Саро, Паўазер'е і інш. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (47,0%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (30%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалачальныя (11,5%), тарфяна-балотныя (9,3%), пойменныя (2,2%). З міпер. глебаў 73,3% суглінкавых, 20,1% супясчаных, 4,5% пясчаных, 2,1% гліністых. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 49 (цана бала 0,23 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 21, усіх с.-г. угоддзяў 37. Лясы, пераважна хваёвыя, займаюць 21% тэрыторыі. Насляюць раён беларусы, ёсць рускія, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 27 чал. на 1 *км*^{2}. Гарадскога насельніцтва 17,5%. Прамысл. па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. У Бешанковічах ф-кі мастацкіх і рымарскіх вырабаў,





камбінаты быт. абслугоўвання і буд. матэрыялаў, ільнозавод, маслазавод, хлебакамбінат, раённае аб'яднанне Сельгастэхніка, лясгас; у Будзілаве і Уле з-ды для перапрацоўкі агародніны. У раёне 27 калгасаў і 5 саўгасаў (1970).

Калгасы і іх цэнтры: «Бачэйкава» *(Бачэйкава)*, «Верны шлях» *(Клешчына)*, «XXI з'езд КПСС» *(Застарынне)*, імя XX з'езду КПСС *(Верхняе Крывіна)*, імя Дзімітрова *(Двор Нізгалава)*, імя Дзяржынскага *(Рубеж)*, «Дружба» *(Касарэўшчына)*, імя Заслонава *(Ганкавічы)*, імя Ільіча *(Ржайка)*, імя Калініна *(Дапаны)*, «Кастрычнік» *(Замашэнне)*, імя Конанава *(Заручэўе)*, імя Леніна *(Полькавічы)*, «Ленінскі шлях» *(Мамойкі 1-я)*, імя Карла Маркса *(Луг)*, «Новае жыццё» *(Крывое Сяло)*, «Палітаддзелец» *(Камоскі)*, «Перамога» *(Навікі)*, «1 Мая» *(Чурылава)*, «Радзіма» *(Свяча)*, «Савецкая Беларусь» *(Паляцы)*, «Світанне» *(Улазавічы)*, імя Свярдлова *(Стрыжава)*, «40 гадоў БССР» *(Вядзерава)*, «Уперад» *(Забелле)*, імя Фрунзе *(Вярхоўе)*, імя Чкалава *(Хізава)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Астроўна» *(Астроўна)*, імя Карапеўскага (пас. *Мірны*), імя Раманава *(Ула)*, «Сініцы» *(Сініцы)*, «Сокарава» *(Сокарава)*.

С. гасп. спецыялізуецца на льнаводстве і малочна-мясной жывёлагадоўлі, вырошчванні збожжа і бульбы. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі каля 55% тэр. У раёне асушана 6,5 тыс. *га* (на пач. 1970) забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) 46,2, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 19,7, бульбай 6,2, тэхнічнымі 3,9, кармавымі культурамі 16,1. У 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 32,6, у т. л. кароў 16,8; свіней 17,9, авечак і коз 7,4. Па тэр. раёна праходзяць шашэйныя дарогі Віцебск — Лепель, Шуміліна — Сянно і інш. На пач. 1970 у раёне 14 сярэдніх, 14 васьмігадовых, 53 пачатковыя школы, школа рабочай моладзі, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. ў Уле, 9 дашкольных устаноў, 41 клубная ўстанова, 42 бібліятэкі, 39 кінаўстановак, у т. л. 33 стацыянарныя, 7 бальніц, 9 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 2 урачэбна-амбулаторныя ўчасткі. На пач. 1970 у раёне працавала 373 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 28 інжынераў, 12 аграномаў, 22 заатэхнікі, 27 вет. урачоў, 214 настаўнікаў, 30 урачоў; 955 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Зара». *А. С. Акінчыц.* Мінск.

Ваколіца в. Свяча.





Раздзельная ўборка збожжавых у калгасе «Бачэйкава».

БЕШАНКОВІЧЫ, гар. пас. (з 1938), цэнтр Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Прыстань на Зах. Дзвіне, за 55 *км* на З ад Віцебска, 33 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, на шашы Мінск — Віцебск. 4,7 тыс. ж. (1969).

У 15 ст. невялікае паселішча. У 16—17 ст. маёнтак, належала кн. Сапегам, Агінскім, Храптовічам. У 1634 Б. атрымалі магдэбургскае права. У 1708 у час Паўн. вайны ў Б. размяшчаліся рус. войскі на чале з Пятром I, адбыўся руска-польскі ваенны савет, у гонар чаго кн. К. Агінскі пабудаваў тут праваслаўную царкву. Збярогся арх. помнік 18 ст.— *Бешанковіцкі палац*. У Айч. вайну 1812 у Б. размяшчаўся напалеонаўскі гарнізон. У кастр. 1812 рус. войскі пад камандаваннем Вітгенштэйна вызвалілі Б. Да Кастр. рэвалюцыі развіваліся саматужныя промыслы — мыларарны, гапчарны, вытв. гонтаў; у чэрв.— ліп. наладжваліся вялікія кірмашы. У 1907—10 у Б. дзейнічала група Віцебскай арганізацыі РСДРП. Летам 1917 сяляне Б. заявілі, што яны гатовы разам з рабочымі весці барацьбу супраць контррэвалюцыі. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. З 1924 раённы цэнтр. У Айчынную вайну з ліп. 1941 да 25 чэрв. 1944 акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі разбураны і спалены.



Бешанковічы. Агульны выгляд.

Ф-кі: рымарскіх і мастацкіх вырабаў; камбінаты быт. абслугоўвання і буд. м.; ільнозавод, маслазавод, хлебакамбінат, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. 2 сярэднія школы, школа рабочай моладзі, муз. школа, Дом культуры, 2 б-кі, Дом піянераў, 3 дзіцячыя сады, яслі, бальніца. У скверы помнік У. І. Леніну. На брацкай магіле помнік сав. воінам, якія загінулі ў баях з ням. фашыстамі пры фарсіраванні Зах. Дзвіны і вызваленні Б. у чэрв. 1944. Каля аўтамаб. магістралі Віцебск — Мінск Курган Славы.

БЕЛЬ (Böll) Генрых (н. 21.12.1917, Кёльн), нямецкі пісьменнік (ФРГ). З сям'і скульптара. У 2-ю сусв. вайну быў салдатам. Першыя апавяданні (канец 40-х г.) і раман «Дзе ты быў, Адам?» (1951) выкрываюць фашызм і імперыяліст. вайну. У раманах «І не сказаў ніводнага слова» (1953), «Дом без гаспадара» (1954) паказаў цяжкое жыццё простых людзей у пасляваеннай Зах. Германіі і адраджэнне мілітарызму ў ФРГ. Раман «Вачыма клоуна» (1963) і аповесць «Канец службовай камандзіроўкі» (1966), захоўваючы сацыяльна-крытычную накіраванасць, сведчаць пра трагічную разгубленасць Б. ва ўмовах уздыму рэваншызму. Гал. герой творчасці Б.— чалавек, які імкнецца адстаяць сваю незалежнасць у барацьбе з бурж. грамадствам. Б. абуджае ў сваіх суайчыннікаў пачуццё грамадз. адказнасці, заклікае іх да актыўнага супраціўлення неафашызму.

Тв.: Бел. пер.— Мая дарагая пага, «Полымя», 1967, № 7; рус. пер.— И не сказал ни единого слова. — Хлеб ранних лет, М., 1959; Дом без хозяина, М., 1960; Где ты был, Адам?, М., 1963; Бильярд в половине десятого, М., 1965; Глазами клоуна, М., 1965; Город привычных лиц, М., 1965.

Літ.: Рожновский С. В. Генрих Белль, М., 1965.

БЁМ-БАВЕРК (Böhm-Bawerk) Эйген (12.2.1851—27.8.1914), бурж. эканаміст, прадстаўнік аўстрыйскай школы ў палітычнай эканоміі. Прафесар у Інсбруку і Вене, міністр фінансаў Аўстрыі, прэзідэнт АН. У працах «Асновы тэорыі каштоўнасці гаспадарчых даброт» (1886, рус. пер. 1903), «Капітал і прыбытак» (1884—89, рус. пер., т. 1, 1909), «Тэорыя Карла Маркса і яе крытыка» (1896, рус. пер. 1897) спрабаваў абвергнуць марксісцкую тэорыю прыбавачнай вартасці. Буржуазныя эканаміcты выкарыстоўваюць рэакцыйныя погляды Б.-Б., каб абгрунтаваць «вечнасць капіталізму».

БЕРДА, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Уперад да камунізма». За 4 км на Пд ад Клічава, 100 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. 323 ж., дваро̆ 90 (1970). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У Б. пахаваны Герой Сав. Саюза П. І. *Кавалёў*. Помнік на магіле воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Б'ЕРКСКІ ДАГАВОР паміж Расіяй і Германіяй, падпісаны 11(24).7.1905 Вільгельмам II і Мікалаем II у Б'ёрку каля Выбарга. Быў спробай Германіі перашкодзіць утварэнню англа-франка-рускай кааліцыі. Паводле Б. д. саюзнікі абавязваліся ў выпадку нападу на аднаго з іх памагаць яму ўзброенымі сіламі. Дагавор не набыў сілы, бо супярэчыў руска-франц. ваен. канвенцыі, падпісанай у снеж. 1893. У ліст. 1905 пад націскам кіруючых колаў Мікалай II паведаміў Вільгельму II, што Расія будзе прытрымлівацца саюзніцкіх абавязацельстваў з Францыяй. Гэта па сутнасці зводзіла ўмовы Б. д. на нішто.

БЁРНС (Burns) Роберт (25.1.1759, в. Алаўэй — 21.7.1796), шатландскі паэт. З сям'і беднага арандатара. З 13 гадоў заняў цяжкую працу селяніна. Не змог атрымаць сістэмат. адукацыі. Вялікая паэтычная і гуманіт. культура Б.— вынік самастойных заняткаў. Пісаць вершы пачаў з 15 гадоў. Першы зб. «Вершы, напісаныя пераважна на шатландскім дыялекце» (1786, г. Кілмарнак; 2-е дапоўненае выд. 1787, г. Эдынбург) прынёс літ. прызнанне. Паэт вітаў франц. бурж. рэв. канца 18 ст., адстойваў свабодалюбныя ідэі. Яму належаць узоры філас. («Джон Ячменнае Зярно», «Палёўцы»), інтымнай («Кахане», «Начлег у дарозе»), гераічнай і паліт. паэзіі («Чэсная беднасць», «Дрэва волі»), сатыр. вершы і эпіграмы, паліфан. кантата «Вясёлыя жабракі», аповесць у вершах «Тэм О'Шэнтар». Збіраў і апрацоўваў шатландскія нар. песні для фальк. зб. «Шатландскі музычны музей» С. Джонсана і «Выбраны збор арыгінальных шатландскіх мелодый»



Дж. Томсана. Лірыку паэта высока ацаніў К. Маркс. Творчасць Б. блізкая да нар.-песеннай традыцыі, вызначаецца сапраўдным дэмакратызмам, задушэўнасцю, багаццем формаў, разнастайнасцю рытмічных адценняў. На бел. мову творы Б. перакладаў Я. Семяжон.

Тв.: Бел. пер.— Шатландская слава. Выбранае, Мн., 1957; [асобныя вершы] — у час. «Полымя», 1959, № 1; рус. пер.— Роберт Бёрнс в переводах С. Маршака, кн. 1—2, М., 1963.

Літ.: Елистратова А., Р. Бернс, М., 1957; Райт-Ковалева Р. Роберт Бернс, М., 1965; Колесников В. Н. Роберт Бернс. Очерк жизни и творчества, М., 1967; Никовский М. Вторая родина Бернса расширяет границы, «Дружба народов», 1964, № 6.

Б'ЁРНСАН (Bjørnson) Б'ёрнсцьерне Марцініус (8.12.1832, Доўрэф'ельд — 26.4.1910), нарвежскі пісьменнік. Сын вясковага пастара. Літ. дзейнасць пачаў у 50-я г. (аповесці з сялянскага жыцця «Сюневе Сульбакен», «Арне»; гістар. драмы «Паміж бітвамі», «Кульгавая Гульда»). У п'есе «Марыя з Шатландыі» (1864) паказвае народ як вядучую сілу гісторыі. У 70-я г. стварае сац. драмы «Рэдактар», «Банкруцтва», «Новая сістэма», у якіх выкрывальны антыбурж. пафас спалучаецца з утапічнымі і рэфармісцкімі ідэямі. З 80-х г. складанасць і супярэчлівасць творчасці Б. паглыбляюцца. У 1-й ч. драмы «Звыш наших сіл» (1883) выкрывае рэліг. фанатызм; у 2-й ч. (1895) рэалістычна адлюстроўвае жабрацкае становішча рабочых, іх барацьбу з эксплуататарамі, але адначасова прапагандуе класавы кампраміс. Быў паслядоўны змагар за мір, нац. незалежнасць Нарвегіі, дэмакратыю і сац. справядлівасць. Нобелеўская прэмія (1903).

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1959; Пьесы, Л.—М., 1961.

БЖАСТОЎСКІЯ, старадаўні шляхецкі род (з 1798 графскі), прадстаўнікі якога ў 16—19 ст. адыгрывалі значную ролю ў дзярж. і грамадскім жыцці Беларусі, Літвы і Польшчы.

1) Цыпрыян Павел (1612—88), каралеўскі сакратар з 1645, віленскі стольнік з 1648, рэферэндар літоўскі з 1650, ваявода троцкі з 1684, староста мядзельскі, ашмянскі, быстрыцкі, дэпутат сейма. У 1658, 1661—64 у складзе дыпламат. місій, у 1667 камісар Рэчы Паспалітай у перагаворах з Рус. дзяржавай, якія скончыліся Андрусаўскім перамір'ем. Прыхільнік кандыдатуры рус. цара ці царэвіча на польскі трон. У 1671—72 і 1679 выязджаў у Маскву, каб заключыць саюз супраць Турцыі, у 1683 — каб падпісаць «вечны мір». Вёў дзённікі пасольстваў, сабраў 13 тамоў лістоў, рэляцый і інш. гістар. крыніц.

2) Канстанцін Казімір (1644—1722), д-р тэалогіі з 1669, біскуп віленскі, смаленскі, сакратар Вял. кн. Літ. з 1671, пісар вялікі літоўскі. Апіраючыся на шляхту Вял. кн. Літ., змагаўся супраць магнацкага роду Сапегаў, апазіцыйных да караля. Дамогся пакарання смерцю беларускага філосафа-атэіста К. *Лышчынскага*. Далучыўся да *Віленскай канфедэрацыі 1716*, накіраванай супраць караля.

3) Міхал (1722—21.5.1784), падскарбі вялікі літоўскі, камергер караля з 1749, пісар літоўскі з 1758, ген.-л. з 1753, палкоўнік пях. палка булавы польнай, канюшы літоўскі з 1762, маршалак генеральнай канфедэрацыі літоўскай з 1764. Дэпутат сейма. Вызначаўся злоўжываннямі і гвалтам.

4) Адам (1722—90), ген.-л. войска Вял. кн. Літ. з 1748, кашталян полацкі ў 1758—76, староста ваўкавыскі з 1766, прыхільнік *Барскай канфедэрацыі*, дэпутат сейма.

5) Станіслаў (2.3.1733—8.4.1769), ваявода інфляндскі з 1767, маршалак генеральнай канфедэрацыі літоўскай, дэпутат сейма. Выступаў супраць Барскай канфедэрацыі і падтрымліваў рус. пасла М. В. Рапніна. Валодаў Радашковіцкім і Прапойскім староствамі.

6) Павел Ксаверы (30.3.1739—17.11.1827), вялікі пісар літоўскі з 1762, рэферэндар літоўскі ў 1774—87. У сваім маёнтку Мерач (пазней Паўлава) Віленскага пав. ў 1767 правёў прагрэс. рэформу: дараваў сялянам асабістую вольнасць, замяніў паншчыну чыншам, уладу перадаў сялянскай абшчыне, пакінуўшы за сабою пажыццёвае прэзідэнцтва. У т. зв. Паўлаўскай Рэчы Паспалітай заканадаўчая ўлада належала «сялянскаму сейму», «міністэрствам», былі ўведзены свае грошы, існавалі школа і лекарская дапамога. У 1798 прадаў маёнтак і выехаў за мяжу. У канцы жыцця вярнуўся на радзіму. Аўтар публіцыст. твораў і генеалагічнага нарысу пра Бжастоўскіх (Вільня, 1776).

7) Міхал Геронім (17.4.1762—1806), староста мінскі, чэснік літоўскі, дэпутат чатырохгадовага сейма, у час Таргавіцкай канфедэрацыі ў турме, у час паўстання 1794 чл. Найвышэйшай літоўскай рады і дэпутацыі бяспекі.

8) Ігнат (1823—75), удзельнік паўстання 1863—64 у Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Вучыўся ў Мінску, Маскве; старшыня палаты крымінальнага суда ў Магілёве. У маі 1862 удзельнічаў у Віленскім з'ездзе «белых» як прадстаўнік Магілёўскай губ. У час паўстання чл. грамадз. камісіі ў Сенненскім пав., магілёўскі паўстанцкі ваявода. Распаўсюджваў сярод сялян нелегальную л-ру на бел. і польскай мовах. У чэрв. 1864 сасланы ў Енісейскую губ., там і памёр.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

БЗАРАЎ Георгій Мікалаевіч [1(14).5.1911, с. Стары Батака-Юрт Церскай вобл. Каўказскага краю — 23.11.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1938. У Чырв. Арміі з 1932. На фронце з 1941. Вызначыўся ў вер. 1943 каля Лоева Гомельскай вобл. Полк пад камандаваннем гв. падпалкоўніка Б. фарсіраваў Дняпро, адбіў контратаку ворага. У баі смяротна паранены.

БІБІКАЎ Васіль Мікалаевіч [н.4(17).1.1910, мяст. Прапойск Магілёўскай губ.], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. авіяцыі (1954). З сялян. Чл. КПСС з 1931. З 1927 рабочы ў Ленінградзе. У Чырв. Арміі з 1929. Скончыў Ваен. акадэмію Ген. штаба (1949). Удзельнік баёў



у Іспаніі на баку рэспубліканцаў (1936—37): лётчык, камандзір звяна і атрада. Зрабіў 78 баявых вылетаў. За выкананне баявых заданняў узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга. Са снеж. 1937 камандзір авіяц. брыгады, старшы нам. інспектара ВПС Чырв. Арміі, з чэрв. 1940 камандуючы ВПС арміі, з ліп. 1942 паветр. арміі Далёкаўсходняга фронту. У 1945 удзельнічаў у разгроме Квантунскай арміі Японіі. У 1945—61 у войсках ВПС. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Кіеве.

БІБІКІ, вёска ў Мазырскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 10 *км* на ПдУ ад Мазыра, 152 *км* ад Гомеля, 10 *км* ад чыг. ст. Козенкі, каля шашы (3 *км*) Мазыр — Оўруч (УССР). 633 ж., двароў 222 (1970). Лясніцтва. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

БІБІЛА Юлія Іосіфаўна [н. 29.12.1896 (10.1. 1897), м. Поразава Гродзенскай губ.], беларускі савецкі бібліёграф. З сям'і валаснога пісара. У 1925 скончыла этнолага-лінгвістычнае адда. БДУ. У 1922—37 заг. бел. аддзела Дзярж. б-кі БССР імя Леніна. Збірала краязнаўчы і нац. кніжны фонд, улічыла паасобныя выданні па бел. мове ў Расіі і за яе межамі ў 1835—1916 і кнігі, выдадзеныя ў БССР і за яе межамі ў 1917—24. Распачала работу па бібліягр. рэгістрацыі друку БССР, складанні першай у рэспубліцы краязнаўчай бібліягр. картатэкі і інш. У 1937—59 галоўны бібліёграф фундаментальнай б-кі Саратаўскага ун-та. З ліст. 1959 у Мінску.

Тв.: Летапіс беларускага друку, ч. 2 — Паасобныя выданні на беларускай мове. 1835—1916 гг., Мн., 1929; Летапіс беларускага друку, ч. 3. 1917—1924 г., сш. 1, Мн., 1927; Летапіс беларускага друку, ч. 4 — Перыядычны друк на беларускай мове, Мн., 1927; Беларускі перыядычны друк. 1917—1927 гг., Мн., 1929; (скл. М. Г. Крэканэ і А. А. Сакольчык пры ўдзеле Ю. І. Бібілы). Бібліяграфія па гісторыі Беларусі, Мн., 1969.

БІ-БІ-СІ, гл. *Брытанская радыёвяшчальная карпарацыя.*

БІБЛІЯ (грэч. biblia кнігі), зборнік «свяшчэнных кніг» іудзейскай (Стары запавет) і хрысціянскай (Стары і Новы запаветы) рэлігій, якія іудзеі і хрысціяне лічаць «словам бога». Складаецца з мноства частак, якія паявіліся ў розны час. Асн. (з 39) кнігі Старога запавету — Пяцікніжжа Майсея (Быццё, Выхад, Лявіт, Лікі, Другазаконне). Асн. (з 27) кнігі Новага запавету — 4 Евангеллі (ад Матфея, Маркі, Лукі, Іаана). Адзін з першых фрагментаў Старога запавету адносіцца да 13 ст. да н. э., а канчаткова Стары запавет укамплектаваны к 1 ст. н. э. Першая кніга Новага запавету Апакаліпсіс з'явілася ў 68—69 н. э., апошняя — у канцы 2 ст.

Традыцыйнае багаслоўе вучыць пра боскае паходжанне Б., якая нібыта прадыктавана богам і запісана Майсеем і інш. прарокамі (Стары запавет) і вучнямі Хрыста (Новы запавет). У Б. адлюстраваны ўмовы жыцця і ідэалогія стараж. народаў. Пра розныя, часам супярэчлівыя крыніцы кніг Б. сведчаць паўтарэнні, адрозненні ў стылі. Змест Б.— шматлікі набор біяглуздзіцы, недакладнасцей, памылак. Гісторыя стараж. народаў падаецца ў рэліг. духу. Біблейская крытыка, карыстаючыся метадамі тэксталагічнага і філалагічнага аналізу, выявіла істотныя супярэчнасці Б. Супярэчлівы характар зместу Б. даваў падставу для розных ерэтычных поглядаў, узнікнення сумненняў і спрэчак веруючых. Таму каталіцкая царква не дазваляла перакладаць Б. на жывыя мовы, забараняла чытаць Б. ўсім, апрача духавенства. Заслугоўвае ўвагі выданне Б. Францыскам Скарынам у 1517—19. Скарына выдаваў біблейскія кнігі на роднай мове са сваімі прадмовамі і пасляслоўямі.

Марксісцкая крытыка Б. абвяргае рэліг. характар біблейскіх кніг, ацэньвае іх толькі як помнік л-ры, які адлюстроўвае жыццё, погляды і звычаі многіх пакаленняў стараж. народаў. Б. выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца пануючымі класамі для таго, каб трымаць працоўных у паслушэнстве, зацямняць іх свядомасць і ўвекавечыць эксплуататарскі лад.

Літ.: Энгельс Ф. Бруно Бауэр и первоначальное христианство, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 19; его ж. Книга откровения, там жа, т. 21; Виппер Р. Возникновение христианской литературы, М.—Л., 1946; Крывелев И. Книга о Библии, 2 изд., М., 1959; Лившиц Г. М. Что такое «священные книги»?, Мн., 1962; Происхождение Библии, М., 1964; Ранович А. Очерк истории древнееврейской религии, М., 1937; Решетников Н. А. Библия и современность, М., 1968; Токарев С. Религия в истории народов мира, 2 изд., М., 1965; Ярославский Ем. Библия для верующих и неверующих, М., 1965.

Е. С. Пракошына. Мінск.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ЧАСОПІСЫ, перыядычныя выданні, у якіх асвятляюцца пытанні гісторыі, тэорыі і практыкі *бібліяграфіі*; вядзецца ўлік, рэферыраванне літаратуры.

Першы бібліягр. часопіс у Расіі — «Санкт-Петербургские ученые ведомости» (выдаваўся ў 1777 М. І. Навіковым, выйшла 22 нумары). У 19 ст. выходзілі: «Библиографические листы» П. І. Кепена (1825—26), «Русский библиографический листок» А. А. Смірдзіна (1858), «Библиографические известия» М. В. Вольфа (1863), «Книжные новости» Ф. Ф. Паўленкава (1867—68), «Указатель по делам печати» (1872—78), «Российская библиография» Э. К. Гарцье (1879—82), «Библиограф» пад рэд. М. М. Лісоўскага (1884—1914), «Книговедение» Маскоўскага бібліягр. гуртка (1894—97) і інш. Бібліягр. часопісы пач. 20 ст. «Критическое обозрение» (1907—09) і «Бюллетени литературы и жизни» (1911—18) мелі ліберальна-бурж. кірунак. З 1907 выдаецца «Книжная летопись», першы орган дзярж. рэгістрацыі друкаваных твораў.

У СССР створана сістэма рэгістрацыйна-інфармацыйных выданняў Усесаюзнай кніжнай палаты і кніжных палат саюзных рэспублік. Выдаюцца: «Летопись журнальных статей» (з 1926), «Летопись периодических изданий СССР» (з 1933), «Летопись газетных статей» (з 1936), «Летопись рецензий» (з 1935), «Картографическая летопись» (з 1931), «Нотная летопись» (з 1931), «Летопись печатных произведений изобразительных искусств» (з 1934). З 1934 выходзяць бюлетэні Фундаментальнай б-кі грамадскіх навук АН СССР. У 1936—53 Дзярж. навук. б-ка Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР выпускала бібліягр. часопіс у 6 серыях «Новости технической литературы». У 1952 засн. Усесаюзны ін-т навук. і тэхн. інфармацыі, які выдае серыю рэфератыўных часопісаў па пытаннях прыродазнаўства, матэматыкі і тэхнікі.

Кніжная палата БССР выдае з 1924 *«Летапіс друку БССР»*. У 20—30-я г. краязнаўчую бібліяграфію БССР вёў час. *«Савецкая краіна»* (1925—33; да 1930 наз. «Наш край»). У 1932 у рэспубліцы выдаваўся штомесячны час. «Кніга масам», які спачатку меў бібліятэчна-бібліяграфічны, потым крытыка-бібліяграфічны кірунак. Выйшла 7 нумароў. У 1934 Дзярж. б-ка імя Леніна выдала 10 нумароў «Крытыка-бібліяграфічнага бюлетэня» — органа рэкамендацыйнай бібліяграфіі БССР, які друкаваў анатацыі на новыя кнігі, зводкі рэцэнзій на рэсп. выданні і рэцэнзіі. У 1954—55 і 1958—59 Дзярж. б-ка БССР імя Леніна выдавала ў дапамогу раённым, сельскім і калгасным б-кам бюлетэнь «Новыя кнігі» (у 1958—59 выходзіў як дадатак да «Летапісу друку БССР»). З 2-й пал. 1960 выходзіць штомесячны рэкамендацыйны бібліягр. бюлетэнь «Новыя кнігі БССР». Галіновую бібліяграфію ў рэспубліцы вядуць аддзелы крытыкі і бібліяграфіі навук., грамадска-паліт. і літ. часопісаў.

Найбольш вядомыя зарубежныя б. ч.: Балгарыя — «Български книгопис» («Балгарская бібліяграфія», з 1897); Вялікабрытанія — «British National Bibliography» («Брытанская нац. бібліяграфія», з 1950); Венгрыя — «Magyar könyvszemle» («Венгерскі бібліятачны агляд», з 1876); ГДР — «Deutsche Nationalbibliographie» («Нямецкая нац. бібліяграфія», з 1931); ЗША — «Cumulative Book Index» (С. В. І. «Камулятыўны паказальнік кніг», з 1898); Італія — «Bibliografia Nazionale Italiana» («Нац. бібліяграфія Італіі», з 1886); Польшча — «Przewodnik bibliograficzny» («Бібліяграфічны даведнік», з 1944); Францыя — «Bibliographie de la France» («Бібліяграфія Францыі», з 1811); Чэхаславакія — «Bibliografický katalog CSSR», («Бібліяграфічны каталог ЧССР», з 1953) і інш.

Літ.: Общая библиография, М., 1957; Кирпичева И. К. Библиография в помощь научной работе. Методическое и справочное пособие, Л., 1958; Государственная библиография СССР, 2 изд., М., 1967; Библиотечное дело в зарубежных странах. Сб. ст., М., 1965.

А. Дз. Васілеўская, Л. І. Збралевіч. Мінск.

БІБЛІЯГРАФІЯ (грэч. biblion кніга + graphō пішу), галіна ведаў, якая займаецца выяўленнем, улікам, апісаннем, сістэматызацыяй і аналізам друкаваных (рукапісных) твораў, распрацоўкай прынцыпаў і метадаў бібліяграфавання друкаваных выданняў. Тэрмінам «Б.» абазначаюць таксама бібліягр. паказальнікі, спісы і агляды л-ры.

Зарадзілася Б. ў старадаўнія часы. Грэк Калімах у 3 ст. да н. э. склаў бібліягр. таблицы на падставе каталогаў Александрыйскай б-кі. Хуткае развіццё Б. пачалося з узнікненнем друкарства. У 1545 швейц. вучоны і бібліёграф Конрад Геснер напісаў працу «Усеагульная бібліятэка». Да паслуг кніжнага гандлю і вучоных у 2-й пал. 17—18 ст. узнікае галіновая Б. З'яўляюцца першыя нац. рэтраспектыўныя рэпертуары (зборы за мінулы час) кніг. Пазней Б. ўдасканальваецца, робіцца неад'емнай часткай навук. працы. У Расіі Б. спачатку абслугоўвала патрэбы царквы. Першы бібліягр. помнік старажытнарус. пісьменнасці — «Богословьца от словес» у «Наборнике Святослава» (1073). У канцы 15 ст. складзена «Описание рукописей Кирилло-Белозерского монастыря», у 1584 «Указец» Арсенія Высокага, у канцы 17 ст. «Оглавление книг, кто их сложил». У 18 ст. Б. выкарыстоўваецца для пашырэння свецкіх ведаў, яе развіццё звязана з дзейнасцю Пецярбургскай АН, з імёнамі М. В. *Ламаносава* і рус. асветніка М. І. *Навікова*. У той час былі зроблены першыя спробы выдання спец. бібліягр. часопісаў. Значны ўклад у рус. Б. зрабілі бібліёграфы В. С. *Сопікаў*, В. Р. Анастасевіч, У. І. *Мяжой*, М. М. *Лісоўскі*, К. М. *Дзеруной*, Я. А. Балхавіцінаў, П. П. Пякарскі, П. І. Кепен, Р. М. Генадзі, М. А. *Рубакін* і інш. У 1-й пал. 19 ст. створана В. рус. кнігі за папярэдні час, па некат. галінах ведаў падведзены вынікі выдадзенай навук. л-ры. 2-й пал. 19 ст. характэрны разнастайнасць відаў бібліягр. выданняў, развіццё галіновай і краязнаўчай Б.

У рус. Б. 19 ст., у прыватнасці ў працах А. Х. *Востокава*, П. М. Строева (1796—1876), І. П. Сахарава, А. М. *Пыпіна* і інш., знаходзілі адлюстраванне друкаваныя матэрыялы пра Беларусь і асобныя выданні на бел. мове. Найбольш поўна дарэвалюц. л-ра пра Беларусь сабрана ў бібліягр. паказальніках Мяжова, братоў П. П. і Б. П. Ламбінespecial, С. *Балтрамайціса*, З. М. *Пенкінай*, у працах Я. Ф. *Карскага*, у даведніках польск. і ўкр. бібліёграфаў.

Паспяхова развіваецца сав. Б. У аснове яе метадалогіі ідэі У. І. Леніна, выказаныя ім у агляднае творах К. Маркса і л-ры пра марксізм, а таксама ў рэцэнзіі на бібліягр. паказальнік М. А. Рубакіна «Сярод кніг». Пастанова СНК РСФСР ад 30.6.1920 пра перадачу бібліяграфічнай справы ў РСФСР Нар. камісарыяту асветы, падпісаная Леніным, дала пачатак бібліягр. рэгістрацыі ўсіх друкаваных твораў і дзейнасці Расійскай цэнтр. (з 1935 Усесаюзнай) кніжнай палаты. У СССР склаліся тры асн. віды Б.: дзярж. ўлікова-рэгістрацыйная, навукова-дапаможная і рэкамендацыйная. Створана сістэма бібліягр. устаноў. *Кніжная палата Усесаюзная* і кніжныя палаты саюзных рэспублік вядуць бягучую і рэтраспектыўную універсальную ўлікова-рэгістрацыйную Б. На рэсп. б-кі ускладзена інфармацыйная, навукова-дапаможная і рэкамендацыйная Б. і каардынацыя бібліягр. дзейнасці б-к сваіх рэспублік. Фундаментальныя б-кі АН, б-кі НДІ, ун-таў і інш. навук. і навуч. устаноў, галіновыя навук. б-кі займаюцца бягучай Б. і складаюць рэтраспектыўныя універсальныя і галіновыя бібліягр. паказальнікі л-ры, разлічаныя на спецыялістаў. Ін-ты навук.-тэхн. інфармацыі вядуць бягучую галіновую Б. Дзярж. б-ка СССР імя Леніна — цэнтр рэкамендацыйнай Б. ў СССР; цэнтрамі краязнаўчай Б. з'яўляюцца рэсп. і абл. б-кі. Крытычную Б. (рэцэнзаванне новай л-ры па ўсіх галінах ведаў) вядуць галіновыя часопісы.

На Беларусі бібліягр. дзейнасцю займаюцца *Кніжная палата БССР*, Дзярж. б-ка БССР імя Леніна, навук. універсальныя і галіновыя б-кі і б-кі НДІ. Планамерная бібліягр. работа пачалася з сярэдзіны 20-х г. З 1924 выдаецца *«Летапіс друку БССР»*. Шырокае развіццё атрымала краязнаўчая Б. ў час. *«Савецкая краіна»* (1925—33, да 1930 «Наш край»), «Социалистическое строительство», «Запіскі аддзела прыроды і народнай гаспадаркі» (Бел. АН) і рэкамендацыйная. Першыя бел. бібліягр. дапаможнікі — працы А. Шлюбскага «Матэрыялы да беларускай бібліяграфіі», ч. 4 — «Этнаграфія» (1927), С. А. Дубінскага «Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін» (1933) і інш. У 2-й пал. 40-х і ў 50-я г. ўдасканальваецца сістэма рэгістрацыйнай Б. ў рэспубліцы, выдаюцца сцісліыя рэкамендацыйныя бібліягр. дапаможнікі па актуальнай грамадска-паліт. тэматыцы, узнікае тэматычная Б. Дзярж. б-ка БССР імя Леніна каардынуе бібліягр.

дзейнасць у галіне грамадска-паліт., філал. і мастацтвазнаўчых навук; Фундаментальная б-ка імя Я. Коласа АН БССР — прыродазнаўчых і дакладных навук; Урадавая б-ка імя М. Горкага — у галіне тэхнікі; Рэсп. навук. мед. б-ка — мед. навук; Рэсп. навук. с.-г. б-ка — па с. гасп. Значны ўклад у развіццё бел. сав. бібліяграфіі зрабілі Ю. І. *Бібіла*, Н. Б. *Ватацы*, І. Б. *Сіманоўскі*.

АСНОЎНАЯ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ ПРА БЕЛАРУСЬ

Межов В. И. Русская историческая библиография. Указатель книг и статей по русской и всеобщей истории и вспомогательным наукам за 1800—1854 вкл., т. 1—3, СПб., 1892—93; Ягоо ж. Русская историческая библиография за 1865—1876 вкл., т. 1—8, СПб., 1882—90; Ламбин П. П. и Ламбин Б. П. Русская историческая библиография, в 10 т., СПб., 1861—84. [агляд л-ры па гадах з 1855 па 1864]; Балтрамайтис С. Сборник библиографических материалов для географии, истории, истории права, статистики и этнографии Литвы...; 2 изд., СПб., 1904; [Пенкина З. М.] Полесье. Библиографические материалы по истории, географии, статистике, этнографии и экономическому состоянию Полесья, СПб., 1883; Карский Е. Ф. К вопросу о разработке старого западнорусского наречия. Библиографический очерк, Вильна, 1893; Ягоо ж. Белорусы, [т. 1] — Введение к изучению языка и народной словесности, Вильна, 1904; т. 3 — Очерки словесности белорусского племени, в. 2 — Старая западнорусская письменность, П., 1921; т. 3, в. 3 — Художественная литература на народном языке, П., 1922.

АСНОЎНАЯ БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ

(бібліяграфічныя паказальнікі)

Ватацы Н. Б. Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі (1917—1960), Мн., 1962; Яе ж. Беларускае літаратуразнаўства і крытыка (1945—1963), Мн., 1964; Яе ж. Беларуская савецкая драматургія [1917—1965], Мн., 1966; Саламевіч І. У. (скл.). Беларускі фальклор. 1926—1963, Мн., 1964; Беларускае мовазнаўства. 1825—1965 гг., Мн., 1967; Белорусское искусство, в. 1, Мн., 1965; Химия в изданиях ученых Белоруссии. 1945—1963, Мн., 1964; Здравоохранение Белорусской ССР за сорок лет (1919—1958), Мн., 1961; Свирина Е. В. (сост.). Энергетические ресурсы БССР и их использование. 1922—1965, Мн., 1967; Народное хозяйство Белорусской ССР (1917—1963 гг.), в. 1, М., 1965; Універсальная бібліяграфія: Перыядычны друк Беларускай ССР, [в. 1 — Часопісы (1917—1958), фический список белорусских старопечатных изданий XVI—XVIII вв., Мн., 1961; Русская дореволюционная книга о Белоруссии (1802—1916), Мн., 1964; Беларуская ССР у друку сацыялістычных краін. 1946—1965, ч. 1, Мн., 1966; Збралевіч Л. П. и Федулова С. В. Библиография Белорусской советской библиографии. 1922—1961, Мн., 1963; Замежная літаратура ў перакладзе на беларускую мову. 1917—1963, Мн., 1965; Фалькоўская Г. І. (скл.) Мастацкая літаратура народаў СССР у перакладзе на беларускую мову, Мн., 1967; Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм. Мн., 1969.

Літ.: Ленін У. І. Рацэнзія на кнігу [М. А. Рубакін «Сярод кніг»]. Тв., т. 20 (Поли. собр. соч., т. 25); Ягоо ж. Карл Маркс (Кароткі біяграфічны нарыс з выкладам марксізма), Тв., т. 21 (Поли. собр. соч., т. 26); Сборник руководящих материалов по библиотечной работе, М., 1963; Крупская Н. К. О библиотечном деле, М., 1957; Сорок лет советской государственной библиографии (1920—1960). Сб. ст., М., 1960; Государственная библиография СССР, 2 изд., М., 1967; Симон К. Р. История иностранной библиографии, М., 1963; Симановский Н. Б. Белорусская советская библиография, ч. 1, Мн., 1965.

А. Дз. Васілеўская, Л. І. Збралевіч. Мінск.

БІБЛІЯТЭКА (грэч. biblion кніга+thēkē сховішча), культурна-асветная ўстанова, якая займаецца зборам кніг і інш. друкаваных і рукапісных твораў, іх спецыяльнай апрацоўкай і захаваннем, вядзе прапаганду кніг і выдачу іх чытачам. Па сваім прызначэнні Б. бываюць: масавыя; навуковыя і спецыяльныя; *бібліятэкі дзіцячыя*. Масавыя Б. дзеляцца паводле прыналежнасці (дзяржаўныя, прафсаюзныя, калгасныя, школьныя і г. д.) і паводле тэрытарыяльнай адзнакі (рэспубліканскія, краявыя, абласныя, гарадскія, раённыя, сельскія). Да навук. і спец. адносяцца дзярж. навуковыя, вытворчыя (тэхн. б-кі на прадпрыемствах і транспарце), бібліятэкі н.-д. устаноў і ВНУ.

Б. ўзніклі ў глыбокай старажытнасці. Спачатку яны збіралі гліняныя і каменныя таблічкі (Асірыя, Вавілон), потым — папірусныя скруткі (Егіпет), пергаментныя, а пазней папяровыя рукапісныя кнігі. Найбольш вядомымі Б. ант. свету былі Александрыйская (3 ст. да н. э.), асірыйскага цара Ашурбаніпала (7 ст. да н. э.). У сярэднія вякі Б. існавалі пры манастырах, каралеўскіх і княжацкіх дварах і першых ун-тах. Іх колькасць выраслa пасля таго, як было вынайдзена друкарства (сярэдзіна 15 ст.). На тэр. СССР Б. вядомыя з 3 ст. (Харэзм). Першыя манастырскія і царкоўныя Б. ў Ст. Русі ўзнікаюць у 11 ст. У 1037 засн. Б. пры Сафійскім саборы ў Кіеве. У 1714 указам Пятра I засн. Б. ў Пецярбурзе (Бібліятэка АН СССР у Ленінградзе). У 1756 адкрылася Б. пры Маскоўскім ун-це, у 1814 — Публічная ў Пецярбурзе (з 1932 Дзярж. публічная б-ка імя Салтыкова-Шчадрына; гл. *Бібліятэка дзяржаўная публічная*), у 1862 — Маскоўская публічная пры Румянцаўскім музеі (з 1925 Дзярж. б-ка СССР імя Леніна; гл. *Бібліятэка дзяржаўная СССР*).

На Беларусі Б. вядомыя з 11 ст., пераважна пры цэрквах і манастырах. У 2-й пал. 16 ст. заснаваны ў Вільні, Полацку, Слуцку, Мінску, Магілёве. Некаторыя знішчаны каталіцкім духавенствам (у 1581 у Вільні спалены тысячы рукапісаў, летапісаў, друкаваных кніг), у час пажараў, войнаў. У 16—17 ст. Б. мелі праваслаўныя брацтвы ў Мінску,

Абанементны аддзел Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.



Вільні, Магілёве, Полацку, Віцебску і інш., буйныя феадалы (Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы і інш.; у канцы 18 ст. ў маёнтку Храптовіча ў Шчорсах сабрана шматтысячная Б. рэдкіх кніг). У пач. 19 ст. існавала Б. пры Полацкай езуіцкай акадэміі (у 1813 тут было каля 40 тыс. тамоў), Слуцкай вышэйшай пратэстанцкай школе (у ліку інш. выданняў былі рэдкія кнігі бел. рэфарматараў), Нясвіжскім ліцэі. У 19 ст. вядомыя прыватныя б-кі Т. Нарбута, І. Даніловіча, А. Кіркора і інш. У Слуцку Ю. Бергель сабраў больш за 3 тыс. рэдкіх кніг, рукапісаў і дакументаў. Ствараюцца публічныя Б. ў Гродне (1830; 1863), Магілёве (1833; 1861), Мінску (1845; 1900), Віцебску (1857) і інш. У пач. 90-х г. Віленская навуч. акруга арганізавала Б. пры нар. вучылішчах (у 1894 былі 733 такія Б.). Яны мелі невялікі кніжны фонд і камплектаваліся пераважна кнігамі рэліг.-павучальнага зместу. Сапраўды народнымі былі толькі Паўленкаўскія Б. (ствараліся ў пач. 20 ст. на сродкі прагрэс. выдаўца Ф. Ф. *Паўленкава*). Больш вядомая з іх — *бібліятэка імя Ф. Ф. Паўленкава* ў в. Астрамечава. У час рэвалюцыі 1905—07 узніклі нелегальныя Б. пры с.-д. арг-цыях (Мінскай групы РСДРП, бальшавіцкай арг-цыі Брэсцкай крапасной артылерыі і інш.). У 1913 у Расіі было 12,6 тыс. масавых Б. з кніжным фондам каля 9 млн. тамоў, у т. л. на тэр. Беларусі 851 з 423 тыс. тамоў.

Пасля Кастр. рэвалюцыі хутка расце колькасць Б. і хат-чытальняў. Акрамя дзяржаўных, ствараліся прафсаюзныя Б. У БССР у 1921 арганізавана першая навук. Б. ў БДУ; у 1922 — аб'яднаная Бел. дзярж. і універсітэцкая б-ка (гл. *Бібліятэка дзяржаўная БССР*), яе філіялы ў Віцебску (1925), Магілёве (1928), Гомелі (1933) і пры Доме ўрада (1934) пазней рэарганізаваны ў абласныя Б., філіял пры Доме ўрада — ва Урадавую б-ку імя М. Горкага (гл. *Бібліятэка ўрадавая*). У 1925 засн. Б. пры Інбелкульце (з 1929 Фундаментальная б-ка АН БССР; гл. *Бібліятэка фундаментальная АН БССР*). На пач. 1941 у СССР налічвалася 95,4 тыс. масавых Б. з кніжным фондам 184 767 тыс. тамоў, у т. л. ў БССР 4172 з кніжным фондам 5028 тыс. тамоў. У Айч. вайну ням.-фаш. акупанты знішчылі больш за 100 млн. кніг. Але ўжо ў 1950 колькасць Б. і іх агульны фонд перавысілі даваенны ўзровень. У вер. 1959 ЦК КПСС прыняў пастанову аб стане і мерах паляпшэння бібліятэчнай справы ў краіне. На 1.1.1968 у СССР налічвалася 125 тыс. масавых Б. з кніжным фондам 1198 млн. тамоў. У БССР на 1.1.1970 было 7255 масавых Б. з кніжным фондам 51908,4 тыс. тамоў. Агульнае кіраўніцтва Б. ажыццяўляе Мін-ва культуры СССР. Карыстанне б-камі бясплатнае. Для іх будуюцца спец. будынкі з кнігасховішчамі, чытальнымі заламі, памяшканнем для бібліятэчнага абслугоўвання. Камплектуюцца Б. з дапамогай бясплатнага абавязковага экземпляра, праз *бібліятэчныя калектары*, кнігарні, унутрысаюзны і міжнар. кнігаабмен.


Найбольш вядомыя зарубежныя Б.: Кангрэсу ЗША (Вашынгтон, з 1800; 43 млн. т.), Брытанскага музея (Лондан, з 1753; 7,5 млн. т.), Нацыянальная Б. ў Парыжы (14 ст.; каля 5 млн. т.), Нацыянальная парламенцкая Б. Японіі (Токіо, з 1948; 5 млн. т.), Нацыянальная Б. Фларэнцыі (з 1747; 4 млн. т.), Нацыянальная Б. Польшчы (Варшава, з 1928; 2 млн. т.), Дзярж. Б. ЧССР (Прага, з 1958; 3,6 млн. т.), Нацыянальная Б. Сербіі (Белград, з 1832; 500 тыс. т.), Нацыянальная Б. ДРВ (Ханой, з 1919; 1,3 млн. т.).

А. Дз. Васілеўская, Л. І. Збралевіч, К. Г. Майрычава. Мінск.

БІБЛІЯТЭКА ДЗЯРЖАЎНАЯ БССР імя У. І. Леніна ў Мінску, цэнтральнае кнігасховішча БССР, навукова-метадычны і навукова-бібліяграфічны цэнтр у галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. 15.9.1922 пераўтворана з б-кі Бел. ун-та, заснаванай у 1921 (гл. *Бібліятэка фундаментальная БДУ*), у аб'яднаную Бел. дзярж. і універсітэцкую б-ку з Бел. кніжнай палатай пры ёй. У 1922 пры б-цы арганізоўваецца аддзел бел. л-ры і бібліяграфіі, пачынаецца работа ў галіне рэтраспектыўнай нац. і краязнаўчай бібліяграфіі. 14.5.1926 б-ка вылучана ў самастойную Бел. дзярж. б-ку. Пастановай СНК БССР ад 10.8.1932 у сувязі з 10-годдзем рэарганізавана ў Дзяржаўную б-ку і бібліягр. ін-т БССР, ёй прысвоена імя Леніна. На канец 1940 кніжны фонд складаў 1 млн. 600 тыс. экз. Ням.-фаш. захопнікі знішчылі фонды б-кі. Пасля вызвалення Мінска б-ка адноўлена. Кніжны фонд на 1.1.1970 складаў 4667,5 тыс. т.

У б-цы каштоўныя калекцыі, рэдкія выданні, прыватныя зборы Я. Ф. Карскага, М. Я. Грота, У. І. Пічэты, М. А. Янчука і інш. Аддзел бел. л-ры і бібліяграфіі (засн. 1922) з'яўляецца унікальным зборам кніг, выдадзеных на тэр. Беларусі, а таксама кніг пра Беларусь, якія выйшлі з пач. 19 ст. да нашага часу. У ім зберагаюцца першыя творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і інш. бел. пісьменнікаў. У фондзе аддзела многа кніг з аўтографамі. У аддзеле рэдкай кнігі і старадрукаў зберагаюцца зборы першых і прыжыццёвых выданняў твораў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна. Сярод іх 1-е выданне I тома

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна.



«Капітала» Маркса (Гамбург, 1867), пераклад яго на рус. мову (1872); «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» (1894) Ф. Энгельса; адна з ранніх работ Леніна «Новы фабрычны закон» (Жанева, 1899), а таксама «Развіццё капіталізму ў Расіі» (1899), «Што рабіць?» (1902); калекцыя «Вольны рускі друк»; выданні рус. рэвалюц. груп «Вызваленне працы» і «Народная воля»; камплекты гераічных «Полярной звезды», «Колокола»; ленінскіх газ. «Искра», «Вперед», «Пролетарий» і інш. У аддзеле старадрукаў выданні бел. першадрукароў: «Біблія» (Прага, 1517—19) Ф. Скарыны, выданні І. Фёдарава і П. Мсціслаўца «Евангелле учыцельнае» (1568), кнігі з друкарні брата Мамоніча (Вільня, 16 ст.), «Азбука» (1634) В. Ф. Бурцава, «Арыфметыка» (1703) Л. Магніцкага, «Граматыка» (1648) М. Сматрыцкага. Інкунабулы зах.-еўрап. друку: выданні венецыянскай друкарні Альдаў (15—16 ст.), галандскіх друкароў Эльзевіраў (16—18 ст.) і інш. Некалькі нумароў газ. «Мужыцкая праўда» (1863) К. Каліноўскага. У фондзе рэдкай кнігі і старадрукаў (больш за 200 экз.) бел. рукапісы, «Прыходна-расходная кніга магілёўскай царквы за 1730», «Метрычная запісь Быхаўскага прыходу» (1747), творы М. Гэка (16 ст.), рукапісы Я. Коласа, З. Бядулі, Ц. Гартнага, К. Каганца і інш. У фондах б-кі больш як 100 тыс. экз. выяўленчых матэрыялаў, звыш 300 тыс. экз. спец. выданняў тэхн. л-ры і інш.

Да паслуг чытачоў 12 спец. чытальных залаў. Б-ка абслугоўвае за год больш за 40 тыс. чытачоў, якім выдаецца звыш 2 млн. экз. л-ры. Міжнар. абанементам звязана са 130 б-камі і ўстановамі 28 краін свету, міжбібліятэчным — з 842 б-камі СССР і БССР. Распрацоўвае праблемы работы б-к рэспублікі па камуніст. выхаванні працоўных, арг-цыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва, камплектаванні кніжных фондаў, па рабоце з дзіцячым чытачом і інш.; сацыялагічныя даследаванні бібліятэчна-бібліягр. запытаў сав. спецыялістаў, каардынуе сваю работу з інш. навук. б-камі рэспублікі. Выдае «Летапіс друку БССР» (з 1924), штомесячны бібліягр. бюлетэнь «Новыя кнігі БССР» (з 1960), штогоднік «Библиотечное дело в БССР», матэрыялы навук.-інфармацыйнай рэкамендацыйнай і рэтраспектыўнай бібліяграфіі.

Літ.: Государственная библиотека БССР им. В. И. Ленина. Путеводитель, Мн., 1969.

І. А. Санкова. Мінск.

БІБЛІЯТЭКА ДЗЯРЖАЎНАЯ ПА НАРОДНАЙ АСВЕЦЕ імя К. Дз. Ушынскага Акадэміі педагагічных навук СССР, заснавана ў 1925 у Маскве. Спачатку даведачная б-ка Наркамата асветы РСФСР, у 1932 перайменавана ў Цэнтр. б-ку па нар. асвеце, у 1939 аб'яднана з б-кай Ін-та школ і рэарганізавана ў Дзярж. б-ку па народнай асвеце. З 1944 у сістэме н.-д. устаноў Акадэміі пед. навук РСФСР, з 1967 — Акадэміі пед. навук СССР. У 1945 б-цы прысвоена імя Ушынскага. Кніжныя фонды (на 1.1.1969) 1300 тыс. экз., у т. л. 200 тыс. экз. зарубежных выданняў.

Камплектуецца л-рай па нар. асвеце, тэорыі і гісторыі педагогікі, дашкольнай і пед. псіхалогіі, пед. адукацыі. Вядзе н.-д. і метадычную работу, галіновую пед. бібліяграфію. Мае міжбібліятэчны і міжнар. бібліятэчны абанементы. Абменьваецца л-рай з пед. навук. ўстановамі, б-камі і арг-цыямі СССР, сацыяліст. краін і інш. заруб. краін.

М. М. Серабро. Масква.

БІБЛІЯТЭКА ДЗЯРЖАЎНАЯ ПУБЛІЧНАЯ імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе, адна з найбуйнейшых бібліятэк свету. Засн. ў 1795, імя Салтыкова-Шчадрына прысвоена ў 1932. Кніжны фонд (на 1.1.1969) 16 364 387 экз.

Самы поўны ў свеце збор рус., укр., бел. кніг і перыяд. выданняў даровалюц. часу (ад пачатку друкарства на Русі): старадрукаваныя кнігі (у т. л. выданні Ф. Скарыны), рэдкія кнігі [уласная б-ка Вальтэра (7000 т.), 4 тыс. з 40 тыс. вядомых у свеце інкунабул, выданні бел. друкароў братоў Мамонічаў, і інш.]; калекцыі: «Вольны рускі друк», выданняў творцаў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна; збор кніг і газет першых гадоў Сав. улады. У б-цы больш за 300 тыс. рукапісаў, у т. л. Астрамірава евангелле (1056—57), стараж. спіс летапісу Нестара (1377), рукапісныя кнігі 11—12 ст., творы Кірылы Тураўскага, Сымона Буднага, Сімяона Полацкага і інш. У фондзе больш за 1 млн. 107 тыс. тамоў л-ры на мовах народаў СССР, больш за 112 тыс. айч. і замеж. геагр. і астр. картаў, планаў і атласаў 15—20 ст.; 245 тыс. тамоў і сшыткаў нот, і інш. Міжнар. абанементам звязана з 2601 заруб. арг-цыяй у 93 краінах свету. Вядзе навук.-метадычную і н.-д. работу; выдае бібліягр. дапаможнікі, метадычныя каталогі, манаграфіі і інш. У 1939 узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: История Государственной ордена Трудового Красного Знамени публичной библиотеки им. М. Е. Салтыкова-Щедрина, Л., 1963.

В. М. Барашанкай. Ленінград.

БІБЛІЯТЭКА ДЗЯРЖАЎНАЯ ПУБЛІЧНАЯ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ СССР, заснавана ў 1958 у Маскве. Метадычны цэнтр тэхнічных б-к краіны. Кніжны фонд (на 1.1.1969) 5,7 млн. экз. Камплектуецца тэхн. л-рай і перыяд. выданнямі па тэхніцы, якія выходзяць у СССР і за мяжой.

Есць спецыялізаваныя калекцыі: усесаюзны фонд перакладаў тэхн. л-ры, фонды прамысл. каталогаў, алгарытмаў і праграм для электронна-вылічальных машын і інш. Б-ка вядзе н.-д. работу, каардынуе пераклады тэхн. л-ры і бібліягр. работу па тэхніцы, выдае бібліягр. паказальнікі новых прамысл. каталогаў, перакладаў, заруб. перыяд. выданняў, серыю рэтраспектыўных бібліягр. паказальнікаў па актуальных праблемах тэхнікі і інш. Усесаюзны цэнтр міжбібліятэчнага абанементу тэхн. л-ры.

БІБЛІЯТЭКА ДЗЯРЖАЎНАЯ СССР імя У. І. Леніна, заснавана ў Маскве ў 1862. Да 1921 Маск. публічная б-ка пры Румянцаўскім музеі, з 1924 Расійская б-ка імя Леніна, з 1925 Дзяржаўная б-ка СССР імя Леніна. Цэнтр. публічная б-ка і дзярж. кнігасховішча Сав. Саюза, н.-д. ўстанова ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфіі, гісторыі кнігі. Кніжны фонд (на 1.1.1969) 25 млн. экз.

У б-цы зберагаюцца творы 15—20 ст. на 200 мовах (у т. л. на 89 мовах народаў СССР); больш за 9 млн. тамоў заруб. выданняў. У аддзеле рэдкай кнігі да 300 тыс. кніг і часопісаў: усе прыжыццёвыя выданні твораў У. І. Леніна, дарэвалюц. выданні прац К. Маркса, Ф. Энгельса, першыя выданні твораў класікаў маст. л-ры, вялікіх вучоных і інш. Багаты фонд кірылаўскіх кніг 15—18 ст. У аддзеле рукапісаў каля 300 тыс. экз. Есць фонд картаў, нотаў, спец. відаў тэхн. л-ры, мікрафільмаў (больш як 400 тыс. рулонаў). Кніг на бел. мове больш за 40 тыс. У б-цы 18 з 20 вядомых выданняў Ф. Скарыны, рукапісы 16—19 ст., створаныя на тэр. сучаснай Беларусі, большасць твораў дарэвалюц. бел. пісьменнікаў, усе творы сучасных бел. сав. пісьменнікаў, пераклады іх на мовы народаў СССР, а таксама на замежныя мовы, дысертацыйныя работы па л-ры, гісторыі, эканоміцы і геаграфіі Беларусі. Б-ка вядзе кнігаабмен з 3 тыс. ўстаноў у 94 краінах свету. Міжбібліятэчным абанементам звязана з 5 тыс. сав. і з 300 заруб. б-к. Цэнтр рэкамендацыйнай бібліяграфіі для масавых б-к краіны, дае метадычную дапамогу ведамасным б-кам (апрача тэхн.). Выдае «Працы» (з 1957), «Записки отдела рукописей» (з 1938), зборнікі «Библиотеки СССР. Опыт работы», інфарм. бюлетэні. У 1945 узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: История Государственной библиотеки СССР им. Ленина за 100 лет. 1862—1962, М., 1962; Путеводитель по Государственной библиотеке СССР им. В. И. Ленина, М., 1959; Государственная ордена Ленина библиотека СССР имени В. И. Ленина в 1966—1967 годах, М., 1969.

М. М. Клявенскі. Масква.

БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Ф. Ф. ПАЎЛЕНКАВА, адна з першых на Беларусі бясплатных народных б-к. Засн. ў 1905 у в. *Астрамечава* (Брэсцкі р-н) на сродкі фонду Ф. Ф. *Паўленкава*. Бібліятэкарам быў настаўнік Астрамечаўскага нар. вучылішча А. П. Зянкевіч. Камплектавалася творамі рус. і зарубежных пісьменнікаў. Прысылалі кнігі М. Горкі, Я. Купала (выданні суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца»), выдавецтвы. У 1908 мела больш за 1000 кніг, абслугоўвала 240 чытачоў. Хавала і распаўсюджвала нелегальную паліт. л-ру. У 1915 спыніла дзейнасць (з прычыны ням. акупацыі). Адноўлена ў канцы 20-х г.; у 1934 ліквідавана польскімі бурж. ўладамі. З 1946 сельская б-ка імя Паўленкава. Кніжны фонд (на 1.1.1969) больш за 11 тыс. экз. Абслугоўвае каля 800 чытачоў.

К. Г. Майрычава. Мінск.

БІБЛІЯТЭКА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ ў в. Вялікая Кракотка Слонімскага р-на, засн. ў 1927 на сродкі сялян. Арганізатары С. М. Жыткевіч, Р. Р. *Акулевіч*, С. Р. Ігнатовіч, В. П. Трафімовіч і інш. У рабоце б-кі ўдзельнічаў паэт В. Таўлай. Папаўнялася кнігамі за кошт ахвяраванняў і выручкі ад спектакляў, якія ладзіў мясцовы гурток Т-ва бел. школы (ТБШ). Мела бел., рус., укр. і польскую л-ру. У вызваленчым руху Зах. Беларусі б-ка стала дзейсным культурным і рэвалюц. асяродкам. У 1929 закрыта і канфіскавана польскімі бурж. ўладамі. Адноўлена ў верасні 1939. Памагала б-цы У. Ф. *Луцэвіч* — жонка Я. Купалы. Кніжны фонд (на 1.1.1970) больш за 14 тыс. экз.

М. М. Арочка. Мінск.

БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЯ Міністэрства асветы БССР, заснавана 1.9.1965 у Мінску на базе бібліятэкі НДІ педагогікі. Метадычны цэнтр па кіраўніцтве б-камі ўстаноў Мін-ва асветы БССР. У фондах (на 1.1.1970) 142 тыс. экз. кніг і часопісаў. Вядзе рэкамендацыйна-бібліяграфічную і даведачна-бібліяграфічную работу. Мае завочны і міжбібліятэчны абанементы.

БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВАЯ МЕДЫЦЫНСКАЯ Міністэрства аховы здароўя БССР, заснавана ў 1940 у Мінску. Кніжны фонд (на 1.1.1970) 512 154 экз. Есць рэдкія кнігі па медыцыне і сумежных з ёю галінах навукі 18—19 ст., прыжыццёвыя выданні прац вядомых дзеячаў рус. медыцыны, камплекты першых бел. мед. часопісаў (*«Беларуская медычная думка»*, 1924—29) і інш. Вядзе работу ў галіне бел. мед. бібліяграфіі, ажыццяўляе метадычнае кіраўніцтва мед. б-камі рэспублікі (211 б-к). Абменьваецца кнігамі з 245 б-камі СССР, 15 б-камі сацыяліст. краін.

БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, заснавана ў сак. 1960 у Мінску на базе бібліятэкі былой Акадэміі с.-г. навук БССР. Арганізацыйна-метадычны цэнтр с.-г. б-к рэспублікі. Кніжны фонд (на 1.1.1970) 350,1 тыс. экз. Мае 3 філіялы, завочны і міжбібліятэчны абанементы. Вядзе даведачна-бібліягр. работу. Абменьваецца кнігамі з 210 б-камі СССР і 6 б-камі сацыяліст. краін. Рыхтуе штомесячны бюлетэнь «Научно-техническая информация по сельскому хозяйству» (з 1967, выдае Мін-ва с. гасп. БССР).

БІБЛІЯТЭКА ЎРАДАВАЯ імя М. Горкага, заснавана ў 1934 у Мінску на базе даведачных б-к ЦВК, СНК, Дзяржплана БССР, асобных наркаматаў рэспублікі як філіял *Бібліятэкі дзяржаўнай БССР* імя Леніна. У 1936 рэарганізавана ў самастойную навук. б-ку. З 1938 наз. Урадавая б-ка імя Горкага. У Айч. вайну яе фонд (каля 250 тыс. экз.) знішчылі ням.-фаш. акупанты.



Дзяржаўная бібліятэка СССР імя У. І. Леніна.

Хата, у якой да Кастрычніцкай рэвалюцыі размяшчалася бібліятэка імя Ф. Ф. Паўленкава (уверсе). Новы будынак бібліятэкі.



Адноўлена ў 1944. Кніжны фонд (на 1.1.1970) 950 тыс. экз. Абслугоўвае больш за 8 тыс. чытачоў. У складзе б-кі аддзел сав. буд-ва, кабінет новай тэхнікі. Ажыццяўляе арганіз.-метадычнае кіраўніцтва тэхн. б-камі рэспублікі, з 1960 выконвае функцыі рэсп. навук.-тэхн. б-кі. Выдае бібліягр. паказальнікі. Міжбібліятэчны абанемент з 583 б-камі. У фондзе б-кі зберагаюцца бел. сав. перыядычныя выданні даваеннага часу.

БІБЛІЯТЭКА ЎСЕСАЮЗНАЯ ЗАМЕЖНАЙ ЛІТАРАТУРЫ, заснавана ў Маскве ў 1921 пад назвай Неафілалагічная б-ка. З 1948 усесаюзная публічная б-ка і цэнтр. сховішча л-ры на замежных мовах. Фонд (на 1.1.1970) каля 4 млн. экз. л-ры па 128 мовах.

Камплектуе заруб. мастацкую л-ру, л-ру па прыродазнаўчых, грамадска-паліт., філал. навуках, па мастацтве. У фондах унікальныя калекцыі: рэдкія выданні Эразма Ратэрдамскага, Дж. Бакачыо, Ф. Петраркі, І. Ньютана, Вальтэра, Д. Дзідро, Г. Э. Лесінга, інкунабулы, альдзіны, л-ра антыфаш. руху Супраціўлення, л-ра сацыяліст. краін і інш. Міжбібліятэчны абанемент з 2200 б-камі і навук. ўстановамі СССР і 1300 б-камі, выдавецтвамі і ун-тамі 72 заруб. краін. Навук.-бібліягр. аддзел б-кі вядзе н.-д. работу, выпускае зводныя каталогі, бібліятэчна-бібліягр. паказальнікі, даведнікі-манаграфіі, бюлетэні.

БІБЛІЯТЭКА ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ АН БССР імя Якуба Коласа, заснавана ў Мінску 16.2.1925 пры Інбелкульце. З арганізацыяй АН БССР (1.1.1929) увайшла ў яе склад. У Айч. вайну разбурана ням.-фаш. захопнікамі, найбольш каштоўная л-ра вывезена ў Германію. Адноўлена ў 1944. Імя Я. Коласа прысвоена ў 1956. Аб'ядноўвае 20 навук. б-к і філіялаў пры ін-тах АН БССР. Кніжны фонд (на 1.1.1970) 1,5 млн. экз.

Ёсць калекцыі рэдкіх выданняў і рукапісаў, старадрукі, у т. л. пергаменты пач. 16 ст. на бел. мове, «Новый Завет с Псалтырью» (Еўе, 1611), «Лексіконъ славеноросскій» Памвы Бярынды (Куцейна, 1653), «Диоптра» (Магілёў, друкарня М. Вашчанкі, 1698), «Катихисисъ» Л. Зізанія (Гродна, 1783), «Latina grammatica...» («Лацінская граматыка») І. Каневіча (Амстэрдам, 1700), рукапісы «Кітабы» (араб. графікай на бел. мове), зборнікі бел. фальклору і этнаграфіі, першыя даравалюц. выданні бел. л-ры. Асобным фондам захоўваецца б-ка А. Я. і М. А. Багдановічаў. Б-ка збірае рукапісы, архівы відомых вучоных, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў Беларусі. Вядзе навук. і метадычную работу, абменьваецца навук. выданнямі з б-камі 37 краін свету і ўсіх саюзных рэспублік. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Акадэмія навук БССР.* *М. П. Стрыжонак.* Мінск.

БІБЛІЯТЭКА ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ БДУ імя У. І. Леніна, першая ў БССР навуковая бібліятэка. Заснавана ў чэрв. 1921 у Мінску. У 1922 рэарганізавана ў Бел. дзярж. і універсітэцкую б-ку, у 1926 у Бел. дзярж. б-ку (з 10.8.1932 Дзярж. б-ка БССР імя Леніна). З 1931 у БДУ камплектавалася асобная б-ка. У Айч. вайну была знішчана ням.-фаш. захопнікамі. Адноўлена ў 1943 (на ст. Сходня пад Масквой). Мае 2 філіялы, 4 аддзелы, фонд мікрафільмаў. Кніжны фонд (на 1.1.1970) — 965 тыс. экз.

У б-цы ёсць пасобныя выданні 18—19 ст., камплекты рус. даравалюц. пед. і навук. часопісаў, кнігі па гісторыі і этнаграфіі Беларусі, каля 450 абавязковых экз. дысертацый, абаронených у БДУ. Абслугоўвае больш за 18 тыс. чытачоў, вядзе даведачна-інфармацыйную і метадычна-кансультацыйную работу. Кнігаабмен з б-камі ун-таў, акадэмій навук і найбуйнейшых пед. ін-таў СССР і сацыялістычных краін.

БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, галіна ведаў, якая распрацоўвае пытанні арганізацыі і зместу работы бібліятэк. Састаўныя часткі Б.: тэарэт. асновы і гісторыя бібліятэчнай справы; камплектаванне, класіфікацыя, каталагізацыя бібліятэчных фондаў; абслугоўванне чытачоў; прапаганда л-ры; буд-ва і абсталяванне бібліятэчных памяшканняў. Б. цесна звязана з педагогікай і бібліяграфіяй.

Значная роля ў развіцці Б. у Расіі належала М. І. *Навікову,* бібліятэказнаўцам і бібліёграфам В. І. Сабальшчыкову, П. М. Строеву, П. М. Багданаву, М. А. *Рубакіну.* У пач. 20 ст. створана Т-ва бібліятэказнаўства, якое ў 1910 пачало выдаваць першы рус. бібліятэчны час. «Библиотекарь» і ў 1911 склікала 1-ы Усерасійскі з'езд па бібліятэчнай справе. Асн. задача сав. Б.— распрацоўка прынцыпаў, арганіз. асноў, формаў і метадаў абслугоўвання народных мас кнігай. Вял. ўклад у развіццё Б. зрабіла Н. К. Крупская.

У СССР калектывы бібліятэказнаўцаў сканцэнтраваны на бібліятэчных ф-тах ін-таў культуры, пед. ін-таў і ун-таў, у т. л. на бібліятэчным ф-це Мінскага пед. ін-та імя Горкага, пры вялікіх б-ках краіны. У развіццё бел. сав. бібліятэказнаўства значны ўклад зрабіў І. Б. *Сіманоўскі.*

БІБЛІЯТЭКІ АКАДЭМІІ НАВУК СССР, найбольшая ў свеце сістэма навуковых бібліятэк. Аб'ядноўвае 170 б-к (1969), мае 4 бібліятэчныя цэнтры: б-ка АН СССР у Ленінградзе, Фундаментальная б-ка грамадскіх навук імя Волгіна і сектар сеткі спец. бібліятэк акад. устаноў прыродазнаўча-тэхнічнага профілю (у Маскве), Дзярж. публічная навук.-тэхн. б-ка пры Сібірскім аддз. АН СССР у Новасібірску.

Бібліятэка АН СССР у Ленінградзе засн. ў 1714. Складаецца з 29 б-к, кніжны фонд (на 1.1.1969) больш за 12 млн. т. па ўсіх галінах ведаў. Вядзе кнігаабмен з 2800 навук. ўстановамі 99 краін. З'яўляецца каардынацыйным цэнтрам даведачнай і навук. бібліяграфічнай работы б-к СССР у галіне фізіка-матэм. і прыродазнаўчых навук. У 1964 узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Фундаментальная б-ка грамадскіх навук імя Волгіна засн. ў 1918 як б-ка Сацыялістычнай акадэміі грамадскіх навук, у 1924 перайменавана ў б-ку Камуністычнай акадэміі, з 1936 — у сістэме АН СССР. Складаецца з 23 б-к акад. ін-таў гуманітарнага профілю. Кніжны фонд (на 1.1.1969) — 6,7 млн. экз. Даляжаўная публічная навукова-тэхнічная бібліятэка Сібірскага аддзялення АН СССР засн. ў 1918 у Маскве, з 1958 у Новасібірску. Складаецца з 63 б-к. Кніжны фонд (на 1.1.1969) — 5 225 926 экз., у т. л. 2 213 593 экз. замежнай л-ры. Кнігаабмен з 736 арг-цыямі 46 краін свету. Сектар сеткі спецыяльных бібліятэк прыродазнаўча-тэхнічнага профілю АН СССР засн. ў Маскве ў 1934. Складаецца з 45 б-к НДІ АН СССР, якія знаходзяцца ў Маскве. Кніжны фонд (на 1.1.1969) — больш за 1 млн. экз.

Б-кі акадэміі абслугоўваюць навук. ўстановы, супрацоўнікаў, аспірантаў АН СССР і вышэйшых навуч. устаноў, ажыццяўляюць цэнтралізаванае камплектаванне і метадычнае кіраўніцтва навук. б-камі, маюць міжнар. і міжбібліятэчны абанементы, выдаюць інфармацыйныя бібліягр. бюлетэні, складаюць рэтраспектыўныя і тэматычныя бібліяграфіі і інш. Сістэмай б-к АН СССР кіруюць Бібліятэчныя саветы пры Прэзідыуме АН СССР.

БІБЛІЯТЭКІ ДЗІЦЯЧЫЯ, абслугоўваюць дзяцей дашкольнага ўзросту, якія ўмеюць

чытаць, вучняў 1—8 класаў, настаўнікаў, піянерважатых. У Расіі Б. дз. пачалі ствараць ў канцы 19 ст. 1-ы Усерасійскі з'езд па бібліятэчнай справе (1911) вырашыў арганізоўваць у гарадах бясплатныя б-кі для дзяцей, а таксама дзіцячыя аддзелы пры б-ках для дарослых. Такі аддзел быў створаны пры Мінскай гарадской б-цы імя Пушкіна яшчэ да Кастр. рэвалюцыі. У БССР на 1.1.1970 — 273 Б. дз., у фондах якіх 5918,5 тыс. экз. кніг і часопісаў. Асн. тыпы Б. дз.: абласныя, гарадскія, раённыя. Універсальны характар іх фондаў дае магчымасць задавальняць запатрабаванні дзяцей. Дзяцей школьнага ўзросту абслугоўвае таксама шырокая сетка школьных б-к. У БССР такіх б-к больш за 14 тыс. (1970). *З. У. Дзяканава.* Мінск.

БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ, падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі для бібліятэк і бібліяграфічных устаноў.

У дарэвалюц. Расіі не было спец. бібліятэчных навуч. устаноў. У 1912—13 рус. бібліёграф М. М. *Лісоўскі* прачытаў факультатыўны курс кнігазнаўства ў Пецярбургскім ун-це. У 1913 пры Нар. ун-це імя Шаняўскага ў Маскве арганізаваны кароткатэрміновыя бібліятэчныя курсы. Пасля Кастр. рэв. ў краіне склалася і развіваецца адзіная сістэма Б.-б. а. У 1918 у Петраградзе засн. ін-т пазашкольнай адукацыі з кніжна-бібліятэчнай групай, якая ў 1921 рэарганізавана ў кніжна-бібліятэчны ф-т. У 1924 ін-т ператвораны ў Пед. ін-т палітасветработы імя Крупскай, у 1925 — у Камуністычны палітасветінстытут (з бібліятэчным ф-там). У 1921 курс бібліятэказнаўства ўведзены як абавязковая дысцыпліна на ф-тах грамадскіх навук ун-таў. У Маскоўскім ун-це гэты курс выкладаў Б. С. *Бабкарскі.* У 1923 у Маскве засн. Вышэйшыя палітасветныя курсы, якія ў 1924 рэарганізаваны ў Палітасветінстытут, дзе рыхтавалі і бібліятэкараў (у 1927 ін-т аб'яднаны з Акадэміяй камуніст. выхавання імя Крупскай). Бібліятэчныя ф-ты і аддзяленні былі адкрыты ў 23 палітасветных і пед. ін-тах краіны. У 1930 засн. Маскоўскі бібліятэчны ін-т. У 1932/33 навуч. г. бібліятэчны ф-т адкрыты ў Магілёўскім палітасветінстытуце, рэарганізаваным у 1936 у Вышэйшае палітасветвучылішча (бібліятэчнае аддз. пры ім існавала да пач. Айч. вайны). Адначасова вышэйшая Б.-б. а. ажыццяўляецца на вышэйшых бібліятэчных курсах пры вялікіх б-ках. У 1934—36 такія курсы былі пры Дзярж. б-цы БССР імя Леніна.

У СССР падрыхтоўка бібліятэчных кадраў вышэйшай кваліфікацыі вядзецца ў 8 ін-тах культуры: Маскоўскім (засн. ў 1930), Ленінградскім імя Крупскай (засн. ў 1941), Харкаўскім (засн. ў 1934), Усходнесібірскім (засн. ў 1960 у Улан-Удэ), Краснадарскім (засн. ў 1967), Чэлябінскім (засн. ў 1968), Чымкенцкім (засн. ў 1968), Хабараўскім (засн. ў 1968). Яны рыхтуюць спецыялістаў для масавых, навук., дзіцячых і тэхн. б-к. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Акрамя таго, спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па бібліятэчнай справе і бібліяграфіі рыхтуюць бібліятэчныя аддзяленні філал. ф-таў ун-таў (Ашхабад, Баку, Вільнюс, Ерэван, Рыга, Тарту, Фрунзе) і бібліятэчныя ф-ты пед. ін-таў (Алма-Ата, Мінск, Ташкент, Тбілісі). Бібліятэчны ф-т Мінскага пед. ін-та імя Горкага засн. ў 1944, мае дзённае і завочнае аддзяленні. Пры ін-тах культуры ў Маскве, Ленінградзе і пры Дзярж. б-цы СССР імя Леніна з 1930 існуе аспірантура. У 1932—35 была аспірантура пры Дзярж. б-цы БССР імя Леніна. Бібліятэкараў-бібліёграфаў сярэдняй кваліфікацыі для раённых і сельскіх б-к рыхтуюць бібліятэчныя тэхнікумы і бібліятэчныя аддз. культасветвучылішчаў, у т. л. Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя Пушкіна. Першыя бібліятэчныя тэхнікумы адкрыты ў 1929 у Ленінградзе, Самары, Яраслаўлі. Да 1956 бібліятэкараў сярэд. кваліфікацыі рыхтавалі таксама пры абласных і вялікіх раённых б-ках. З 1960 падрыхтоўка бібліятэкараў для сельскіх б-к вядзецца ў старэйшых класах некат. сярэдніх школ з вытворчым навучаннем.

Дзярж. сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў створана і ў інш. сацыяліст. краінах. Вышэйшая Б.-б. а. ажыццяўляецца на філал. і бібліятэчных ф-тах ун-таў. Бібліятэкараў сярэд. кваліфікацыі рыхтуюць спец. бібліятэчныя школы і курсы. У капіталіст. краінах адзінай сістэмы Б.-б. а. няма. Найчасцей пры ун-тах і ін-тах арганізоўваюцца бібліятэчныя школы і курсы. Станавішча Б.-б. а. ў краінах свету асвятляе «Бюлетэнь ЮНЕСКО для бібліятэк» (выдаецца на англ., франц., ісп. і рус. мовах).

К. С. Верабей. Мінск.

БІБЛІЯТЭЧНЫ КАЛЕКТАР, спецыялізаваная кнігагандлёвая арганізацыя. Асн. функцыі: планамернае і сістэматызаванае забеспячэнне бібліятэк новай л-рай; метадычная і кансультацыйна-бібліяграфічная дапамога ў камплектаванні кніжных фондаў; забеспячэнне б-к прадметамі бібліятэчнай тэхнікі (каталожнымі карткамі, фармулярамі і інш.); бібліятэчная апрацоўка кніг (каталагізацыйнае апісанне, класіфікацыя і інш.). Пачатак дзейнасці Б. к. пакладзены Дэкрэтам СНК «Аб цэнтралізацыі бібліятэчнай справы ў РСФСР» ад 3.11.1920, падпісаным У. І. Леніным. Асн. тып Б. к.— абласны. У 1968 паслугамі Б. к. БССР карысталася 7488 б-к.

Літ.: Поливановский С. Е. и Корнюшко Ф. М. Советская книжная торговля, М., 1964.

БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ІНСТЫТУТЫ, гл. *Культуры інстытуты.*

БІГОСАВА, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на р. Росіца. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Полацк — Даўгаўпілс. За 23 *км* на ПнЗ ад Верхнядзвінска, 180 *км* ад Віцебска. Аўтобусная ст. 1144 ж., дварóў 413 (1970). З-д «Зоаветінструмент», філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 6 магазінаў. За 2,5 *км* ад Б. зоаветурынарны тэхнікум. Будынак вакзала ў вёсцы ахоўваецца як арх. помнік.

БІДСТРУП (Bidstrup) Херлуф (н. 10.9.1912, Берлін), дацкі графік-карыкатурыст. Чл. Кампартыі Даніі з 1945. Распрацаваў характэрны тып серыі сатыр. і гумарыстычных малюнкаў па бытавыя і паліт. тэмы. Яго карыкатуры — дабрадушна вясёлыя, гнеўныя і выкрывальныя, палітычна завостраныя — сістэматычна друкуюцца (з 1936) у дацкай газ. «Land og Folk» («Краіна і народ») і інш., у сав. прэсе, выдаюцца асобнымі альбомамі. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1963. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Данія.*

Тв.: Рисунки (пер. тэксту з дацкага), в 4-х т., т. 1—3, М., 1968.

Літ.: Малятников О. Оружием смеха, М., 1966.

БІДЭРМЕЕР, бідэрмаер, рэалістычная плынь у нямецкім і аўстрыйскім мастацтве 20—40-х г. 19 ст. Назва ўзнікла ў 50-я г. ад прозвішчаў Бідэрман і Вумельмаер — герояў гумарыстычнага час. «Fliegende Blätter» («Лятучыя лісткі»).

Мастацтва Б. адлюстроўвала ідэалогію і паэтызавала сціплае жыццё дробнага бюргера (часам рамесніка ці селяніна). Часта сентыментальнае, але не пазбаўленае гумару, яно процістала

Пісьмовы стол з гадзіннікам. 1820 (злева); столік з чырвонага дрэва. 1830. Германія.






рамантызму, які тады панаваў, і ў той жа час цесна пераплятаўся з ім. Тыповымі прадстаўнікамі Б. ў Германіі былі Л. Рыхтэр, К. Шпіцвег, І. П. Газенклевер, у Аўстрыі — М. Швінд, Ф. Вальдмюлер. Уплыў Б. ў розных ступені адчуваецца ў творах большасці мастакоў таго часу. Тэрмін «стыль Б.» ужываецца ў архітэктуры і прыкладным маст. (перш-наперш у мэблі, гл. рыс.) 30—40-х г. 19 ст. У архітэктуры Б. апіраўся на прынцыпы класіцызму, у прыкладным мастацтве — на перапрацаванні ў адпаведнасці з больш сціплымі і утылітарнымі густамі дробнага бюргера ўзоры ампіру.

Літ.: Schmidt P. F. Biedermeier — Malerei, München, [1922]. *Б. А. Зярноў.*

БІЁНІКА [*бія...* + (электро)ніка], навука, якая ў вырашэнні інжынерных задач выкарыстоўвае біялагічныя метады, веды пра біялагічныя працэсы і будову арганізмаў. Б. таксама можна вызначыць як навуку пра метады стварэння тэхн. сістэм з характарыстыкамі, блізкімі да жывых арганізмаў. Вылучылася з *кібернетыкі* і атрымала афіц. прызнанне на 1-м Нац. сімпозіуме па біёніцы ў Дайтане (ЗША, вер. 1960). Б. скарыстоўвае дасягненні многіх навук: біялогіі, матэматыкі, фізікі, кібернетыкі, эканомікі, радыёэлектронікі. Дасягненнямі Б. карыстаюцца пры стварэнні сродкаў арыентацыі, лакацыі, навігацыі і многіх сістэм касм. караблёў. Яна займаецца распрацоўкай дасканалых тэхн. сродкаў аўтаматызацыі на аснове вывучэння і перанясення ў тэхніку механізму дзеяння адпаведных рэцэптараў жывых істот; пабудовай тэхн. мадэляў нейронаў і нейронавых сетак (нервовых клетак), якія можна было б выкарыстаць у электронных *вылічальных машынах* і кібернетычных сістэмах; стварэннем прылад і сістэм, здольных распазнаваць вобразы і сімвалы (гл. *Персэптрон*); рашэннем найбольш рацыянальнага размеркавання функцый паміж машынай і чалавекам; далейшай авышмікрамініяцюрызацыяй радыёэлектронных і біялагічных сістэм і блокаў; канструяваннем адаптыўных (здольных прыстасоўвацца) і спец. электронных вылічальных сістэм для новых тэхналаг. працэсаў, касм. і авіяц. караблёў і інш.

Зрокавы орган леапардавай жабы і яго электронная мадэль.



На аналогіі з вібрыравальнымі органамі стабілізацыі палёту ў насякомых пабудаваны прылады — гіратроны, што замяняюць *гіраскопы* ў аўтапілотах авышгукавых самалётаў; на аснове вывучэння вачэй насякомых створаны вымяральнікі скорасці палёту самалётаў. Вывучэнне паводзін медуз памагло вынайсці прыладу, якая дае знаць пра набліжэнне шторму; створана электронная тэхніка для распазнавання рачыванняў і сітуацый, высвятлення структур і ўласцівасцей складаных сістэм, вылучэння карыснай інфармацыі пры наяўнасці перашкаджальных фактараў; створаны шэраг канструкцый і машын, якія выкарыстоўваюць формы і аналогіі механізму работы і біял. сістэм арганізмаў.

Н.-д. работы па Б. арганізоўвае і каардынуе ў краіне секцыя АН СССР пры навук. савеце па комплекснай праблеме «Кібернетыка». У саюзных рэспубліках створаны тэрытарыяльныя групы і саветы. На Беларусі група і савет па Б.— пры АН, даследчыя работы вядуцца ў Мінскім радыётэхн. ін-це, Ін-це генетыкі і цыталогіі АН, аддзеле біяфізікі і ізатопаў АН і інш. Асобныя даследаванні па Б. публікуюцца ў тэхн. і некат. біял. часопісах, якія асвятляюць пытанні кібернетыкі, аўтаматыкі, вылічальнай тэхнікі, медыцыны.

Літ.: Вопросы бионики, М., 1967; Обухов В. И. Что такое бионика, Мн., 1965; Проблемы бионики, пер. с англ., М., 1965; Мартека В. Бионика, пер. с англ., М., 1967.

В. І. Абухаў. Мінск.

БІЗНЕС (англ. business гандаль, камерцыйная дзейнасць, біржавая аперацыя), тэрмін, пашыраны ў капіталістычных краінах, асабліва ў ЗША, які азначае прыбытковую дзейнасць. Бізнесмен — дзялок, прадпрыемец.

БІЗОН (Bison bison), млекакормячая жывёла сям. быкоў. Даўж. да 3 *м*, хвост каля 80 *см*, вышыня ў загрыўку 2 *м*, маса да 1 *т*. Выглядам і біялогіяй нагадвае вубра. Тулава моцнае, масіўнае, з высокім гарбом. Ногі кароткія, тоўстыя. Рогі круглыя, гладкія, чорнага колеру. Поўсць густая, цёмна-бурая, на галаве, шыі і плячах значна даўжэйшая. Пашыраны Б. ў Паўн. Амерыцы. У выніку драпежніцкага паляванні амаль вынішчаны. Некалькі дзесяткаў тысяч Б. жывуць у Пе-

лаўстонскім нац. парку (ЗША) і канадскім нац. парку Вуд-Бафала. Ахоўваецца законам. У СССР акліматызуецца ў запаведніку Асканія-Нова.

БІЗЭ (Bizet) Жорж (25.10.1838, Парыж — 3.6.1875), французскі кампазітар. Выдатны прадстаўнік нац. опернай школы, стваральнік рэаліст. муз. драмы. Вучыўся ў Парыжскай кансерваторыі (1848—57, класы фп., аргана, кампазіцыі). Сярод лепшых юнацкіх твораў — класічная па стылі сімфонія C-dur (1855) і аперэта «Доктар Міракль» (1857). Творчыя сувязі з Ф. Галеві і Ш. Гуно і моцны ўплыў мастацтва Італіі, дзе Б. жыў у 1857—60 як лаўрэат Рымскай прэміі, узмацнілі яго цікавасць да т-ра (камічныя оперы «Дон Пракопіо», 1859, і «Гузла Эміра», 1861—62). Некалькі аркестравых п'ес гэтага часу і сімфонія-кантата «Васка да Гама» звязаны з традыцыямі Г. Берліёза. Наступныя оперы 60-х г.— «Шукальнікі жэмчугу», «Іван Грозны», «Перцкая красуня» — адзначаны ідэйна-маст. пошукамі. Нягледзячы на недахопы лібрэта, у іх выявіліся лепшыя якасці стылю Б.— паўната светаадчування, шчодры меладызм, маляўнічая інструментоўка. Разгром Парыжскай камуны, франка-пруская вайна абвастрылі крызіс у творчасці Б. канца 60-х г. і паскорылі выспяванне жыццёва праўдзівага драм. стылю. Хоць Б. і не быў паліт. прыхільнікам Камуны, ён як рэаліст развіў абвешчаныя камунарамі прынцыпы дэмакр. высокаідэйнага мастацтва. Следам за сімфоніяй «Рым», «Маленькай аркестравай сюітай» і 12 дзіцячымі п'есамі для фп. стварыў оперу «Джаміле» (1871) паводле арабскай навелы А. Мюсэ «Намуна». Дакладныя жанравыя і пейзажныя замалёўкі, прасякнёны лірызм і дынамічныя формы ўзбагацілі трактоўку арыентальнай тэмы. Змястоўная і маляўнічая музыка Б. да драмы А. Дадэ «Арлезіянка» (1872). Найвышэйшае дасягненне кампазітара — опера «Кармэн» паводле навелы П. Мерымэ (1874, паст. 1875). Багацце жыццёвых назіранняў, сакавітасць і выразнасць муз. мовы, прасякнутай элементамі цыганскага і исп. фальклору, драм. завостранасць, імклівасць дзеяння прынеслі ёй сусв. вядомасць. «Кармэн» пастаянна астаецца ў рэпертуары Бел. т-ра оперы і балета. У 1956 пастаўлены «Шукальнікі жэмчугу».



Літ. тэ.: Рус. пер.— Письма, М., 1963.

Літ.: Брук М. Бизе, М., 1938; Хохловкина А. Жорж Бизе, М., 1954; Curtiss M. Bizet et son temps, Genève — Paris, 1961.

БІКБАЎ Яўген Архіпавіч [н. 1(14).8.1914, в. Астроленка Верхнеўральскага пав. Арэнбургскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. Вызначыўся 30.6.1944 пры фарсіраванні Бярэзіны каля в. Мурава на Пд ад Барысава. Аддзяленне пад яго камандаваннем прабілася цераз акоплены полымем мост і выбіла праціўніка з 3 дзотаў. Па мосце пераправіліся сав. войскі, якія 3.7.1944 удзельнічалі ў вызваленні Мінска. Жыве на радзіме.

БІКВАДРАТНАЕ ЎРАЎНЕННЕ (ад лац. bis двойчы + quadratus квадратны), ураўненне віду $ax^4+bx^2+c=0$. Рашаецца непасрэдна па формуле $x_{1,2,3,4}=\pm\sqrt{\frac{-b\pm\sqrt{b^2-4ac}}{2a}}$ ці зводзіцца да рашэння *квадратнага ўраўнення* падстаноўкай $x^2=y$.

БІКФОРДАЎ ШНУР, устарэлая назва *вогнеправоднага шнура.*

БІЛЕВІЧ Фёдар Мікалаевіч (н. 21.5.1923, ст. Бада Верхнеудзінскай акругі Забайкальскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Беларус. З сялян. Да вайны рабочы. На фронце з чэрв. 1942. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Ржэвам, Ярцавам; вызваленні Беларусі, Польшчы; Берлінскай аперацыі. Вызначыўся ў баях каля Франкфурта-на-Одэры ў крас. 1945. Кулямётчык Б. з групай салдатаў тры гадзіны адбіваў варожыя контратакі. Жыве ў Мінску.



БІЛЕЦКІ Мікалай Станіслававіч [сапр. Язерскі Павел Сямёнавіч; 17(29).12.1896, Пецярбург — 29.3.1919], беларускі савецкі журналіст. З сям'і ўраджэнца Гомельшчыны, удзельніка руска-турэцкай вайны 1877—78 ген.-л. С. І. Язерскага. Чл. Камуніст. партыі. Скончыў гімназію ў Пецярбурзе, у 1913—16 вучыўся на юрыд. ф-це Петраградскага ун-та. З ун-та прызваны на ваен. службу; у 1916 скончыў ваенна-інж. вучылішча і накіраваны на Паўн.-Зах. фронт. У лют. 1917 рэвалюц. салдатамі выбраны ў палкавы к-т. Са студз. 1918 супрацоўнік аддзела заканадаўчых меркаванняў Наркамата юстыцыі. У ліп. 1918 добраахвотна ідзе ў Чырв. Армію; да снеж. 1918 на Усх. фронце (27-я стралковая дывізія). Са студз. 1919 у Гомелі. Арганізатар і рэдактар газ. «Известия революционного комитета г. Гомеля и уезда»; аўтар многіх яе публіцыст. артыкулаў (выдавалася са студз. да сак. 1919, выйшла 73 нумары). Уваходзіў у склад Гомельскага гарадскога к-та РКП(б) і Гомельскага гарадскога Савета; узначальваў саюз сав. журналістаў Гомеля (засн. 27.1.1919). Закатаван

ваны ў Гомелі ў час *стракапытайскага мяцяжу*. Пахаваны ў брацкай магіле камунараў у Гомелі. Адна з вуліц Гомеля названа яго імем.

І. В. Гарчакова. Мінск; *М. Ф. Мельнікаў.* Крычаў.

БІЛІРУБІН, $C_{33}H_{36}O_6N_4$, прадукт распаду гемаглабіну, адзін з пігментаў жоўці. Мае чырвона-буры колер у растворы, карычневы — у крышталях; растваральны ў хлараформе, бензоле, спірце. Утвараецца найбольш у печані, адтуль з жоўцю выводзіцца ў кішэчнік. Там з яго атрымліваецца урабілін, невялікая частка Б. паступае ў кроў. Пры атручэнні, парушэнні функцыі печані (закупорцы жоўцевых пратокаў) колькасць Б. ў крыві большае. Выяўленне яго ў крыві мае значэнне ў дыягностыцы.

БІЛОННАЯ МАНЕТА (ад франц. billon нізкапробны сплаў), разменная металічная манета. Выпускаецца разам з банкаўскімі і казначэйскімі білетамі і дапаўняе іх у гандлёва-плацежным абароце. Б. м. непаўнацэнная, г. зн. яе намінальная вартасць перавышае вартасць металу, з якога яна вроблена, і выдаткі на яе чаканку. З'яўляецца толькі знакам вартасці тавараў і не можа служыць яе мерай.

Чаканіцца з серабра, медзі, нікелю і інш. металаў і іх сплаваў. Чаканка з'яўляецца дзярж. манаполіяй. У СССР разменная манета выпускаецца белага колеру з медна-нікелевага сплаву вартасцю 10, 15, 20, 50 кап. і 1 руб. і жоўтага — з медна-цынкавага сплаву вартасцю 1, 2, 3, 5 кап. У 1965 у гонар 20-годдзя перамогі над фашысцкай Германіяй выпушчаны ў абарачэнне юбілейныя манеты вартасцю 1 руб., у 1967 да 50-годдзя Сав. улады — вартасцю 10, 15, 20, 50 кап. і 1 руб., у 1970 у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна — вартасцю 1 руб.

«БІЛЬ АБ ПРАВАХ» (англ. Bill of Rights), у ЗША першыя 10 папраўак да канстытуцыі 1787, прынятыя канграсам у 1789 пад націскам народных мас і ратыфікаваныя штатамі ў 1789—91. Папраўкі абвяшчалі: бурж.-дэмакр. свабоды слова, друку, веравызнання, сходаў і петыцый, аддзяленне царквы ад дзяржавы, ад федэральнай улады; права мець і насіць зброю; недатыкальнасць асобы, асабістых папер і маёмасці; захаванне правоў грамадзян, прыцягнутых да судовай адказнасці, і інш. «Б. аб п.» меў прагрэс. значэнне ў развіцці дэмакр. традыцый амер. народа. Кіруючыя колы ЗША груба яго парушаюць.

Літ.: Гончаров Л. Н. К истории политической борьбы в США за «Билль о правах» в 1789—1791 гг., «Научные доклады высшей школы. Ист. науки», 1958, № 3.

БІЛЬДЗЮГІ, вёска ў Шаркоўшчынскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кутузава. За 17 *км* на ПнЗ ад Шаркоўшчыны, 11 *км* ад чыг. ст. Новы Пагост, 214 *км* ад Віцебска. 337 ж., дварой 83 (1970). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік-абеліск 25 сав. воінам і партызанам-землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.


БІЛЬЯРД (франц. billard ад bille шар), настольная гульня, а таксама камплект прылад да яе. Гульня вядзецца на ўсланым сукном стале з бартамі, якія маюць 6 адтулін (лузаў). Кіем ударяюць шары (са слановай косці, пластмасы або металу) адзін аб другі, каб загнаць іх у лузы. Мінская спецыялізаваная фабрыка «Дынама» вырабляе більярды з ігральнымі палямі (*м*) ад 1,2×0,6 да 3,2×1,6.

БІМЕТАЛ, трывалае злучэнне двух розных металаў. Спалучае ўласцівасці (напр., трываласць і электраправоднасць) матэрыялаў, з якіх зроблены. Часта ўжываецца, каб эканоміць рэдкія ці каштоўныя металы.

Асн. метады атрымання Б.: наплаўка вадкага металу на цвёрды слой, зварка пад ціскам, гальванічнае асаджэнне. Ідзе на выраб падшыпнікаў слізгання (сталь — бабіт), адвалаў машын (марганцовістая сталь — сталь), цынкаванага жалеза, дроту (медзь — сталь, нікель — медзь), металургічнага паўфабрыкату. У прыладабудаванні шырока ўжываецца тэрмабіметал з 2 слаёў металу, якія адрозніваюцца каэф. тэрмічнага расшырэння. Б. вырабляюць многія прадпрыемствы Беларусі, у т. л. Магілёўскі металургічны, Віцебскі станкабудаўнічы, Мінскі маторны з-ды.

БІМЕТАЛІЗМ, грашовая сістэма, пры якой у абарачэнні выкарыстоўваюцца золата і серабро. Быў пашыраны ў Еўропе ў 16—18 ст. Пры Б. манеты з абодвух металаў раўнапраўныя. Вартасныя суадносіны паміж двума металамі вызначаюцца дзяржавай (сістэма двайной валюты) або складваюцца стыхійна (сістэма паралельнай валюты). Б. супярэчыць прыродзе грошай як адзінага ўсеагульнага эквіваленту. Асабліва нетрывалая сістэма двайной валюты, бо пад уздзеяннем розных фактараў рынкавыя вартасныя суадносіны золата і серабра адхіляюцца ад вызначаных дзяржавай.


БІНОКЛЬ (ад лац. bini два + oculus вока), аптычная прылада з дзвюма паралельна злучанымі падзорнымі трубамі для назірання аддаленых прадметаў. Мае *аб'ектыў, абарачальную сістэму* (прызмавы Б.) і *акуляр*. Б. падзяляюцца на два тыпы: Галілееў Б. (аб'ектывам служыць збіральная лінза, акулярам — рассейвальная) і прызмавы Б. (гл. рыс.). Галілееў Б. танны і простай канструкцыі, але ў выніку малога поля зроку вырабляецца толькі з малым павелічэннем (ад 2,5× да 3× — тэатральны Б.). Найбольш пашыраны прызмавы Б., ён мае вял. поле зроку, добрую стэрэаскапічнасць і адносна вял. павелічэнне (ад 3× да 18×).



БІНОМ (ад лац. bis двойчы + nomen імя), двухчлен, сума або рознасць двух алгебраічных выразаў — членаў Б. Напр., $2a - b$, $a^2 + \frac{3b}{2a+b}$. Б. віду $(a+b)^n$ наз. *Ньютана біномам.*

БІО — САВАРА ЗАКОН, вызначае велічыню напружанасці магнітнага поля, створанага электрычным токам. Адкрыты франц. вучонымі Ж. Б. Біо і Ф. Саварам у 1820.

Паводле Б. — С. з. адрэзак правадніка Δl, па якім цячэ эл. ток велічынёй I, стварае ў пункце M магнітнае поле напружанасцю $H_M = k\frac{I\Delta l}{r^2}\sin\alpha$, дзе r — адлегласць паміж Δl і пунктам M ($r > \Delta l$), α — вугал паміж r і Δl, k — каэфіцыент, які залежыць ад выбару сістэмы адзінак.



Напраман вектара $\Delta\vec{H}_M$ вызначаецца правілам свярдзёлка і ваўсёды перпендыкулярны да плоскасці, у якой ляжаць r і Δl. Поўная напружанасць магн. поля $\vec{H}$ у пункце M ёсць геаметрычная сума ўсіх $\Delta\vec{H}_M$, створаных усімі Δl.

БІРАБІДЖАН, горад, цэнтр Яўрэйскай а. в. Хабараўскага краю РСФСР, на р. Біра (прыток Амура). Вузел чыг. і шашэйных дарог, 56 тыс. ж. (1970). Маш.-буд., электратэхн., дрэваапр., хім., лёгкая, харч. прамысловасць. Вытв. с.-г. машын, сілавых трансфарматараў, станочных прылад, тэкст. і швейных вырабаў, абутку, мэблі, буд. матэрыялаў. Мех. і буд. тэхнікумы, мед., пед. і культ.-асвет. вучылішчы. Краязнаўчы музей. Засн. Б. у 1928 на месцы паўстанка Ціханькая, з 1937 — горад.

БІРЖА (ням. Börse ад позналац. burse кашалёк), у капіталіст. краінах рынак масавых заменных тавараў і каштоўных папер. Бываюць таварныя і фондавыя.

На таварных Б. праводзіцца аптовы гандаль масавымі аднароднымі таварамі (пшаніца, кава, цукар, шэрсць, бавоўна, каўчук і інш.). Здзелкі заключаюцца на пэўны тэрмін і пераважна маюць спекуляцыйны характар. Адзін тавар шмат разоў купляецца і перапрадаецца, у выніку абароты таварных Б. намнога перавышаюць сусв. вытворчасць таго ці інш. тавару. Манаполіі, якія гаспадараць на таварных Б., штучна павышаюць або паніжаюць цэны шляхам масавых закупак ці продажу тавараў, што вядзе да ўзбагачэння буйных і абяднення дробных і сярэдніх прадпрыемцаў. Найбуйнейшыя таварныя Б. — Чыкагская (ЗША) і Ліверпульская (Вялікабрытанія). Фондавая Б. прызначана для куплі-продажу акцый і аблігацый прадпрыемстваў і дзярж. пазык. Самыя вялікія фондавыя Б. ў Нью-Йорку, Лондане, Парыжы.

У Расіі ў 1914 было 82 біржы. Найбольшыя з іх — Пецярбургская, Адэская, Варшаўская, Крамянчугская, Маскоўская, Кіеўская, Харкаўская. Адзінай фондавай Б. была Пецярбургская, усе інш. — пераважна таварныя. На Беларусі біржавы гандаль не атрымаў развіцця. У 1908 узнікла Мінская лясная і напярэдадні імперыял. вайны Віцебская таварная Б. У СССР да 1930 існавала каля 100 таварных і фондавых Б. Яны служылі сродкам пашырэння таварнага абмену, авалодання рынкам з боку дзяржавы, умацавання на рынку становішча дзярж. і каап. арг-цый.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 3, Мн., 1953, разд. 21—27; Энгельс Ф. Биржа, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 25, ч. 2; Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27).

БІРЖА ПРАЦЫ, установа, якая займаецца пасрэдніцтвам у працаўладкаванні. У капіталіст. краінах выконвае пасрэдніцкія функцыі ў куплі-продажы рабочай сілы на ўмовах, выгадных прадпрыемцам. У эпоху імперыялізму Б. п. ў большасці краін перайшлі ў распараджэнне дзяржавы і, акрамя прамых функцый, ажыццяўляюць рэгістрацыю беспрацоўных. У нашай краіне Б. п. створана ў студз. 1918 для барацьбы з беспрацоўем і стала адзіным органам, які ажыццяўляў цэнтралізаваны ўлік і размеркаванне рабочай сілы, працоўнае пасрэдніцтва і памагаў беспрацоўным. З ліквідацыяй беспрацоўя і развіццём сацыялізм. планавання гаспадаркі ў СССР Б. п. перастала існаваць. У СССР і ў сацыялізм. краінах працаўладкаванне насельніцтва ўскладзена на дзярж. органы, якія займаюцца размеркаваннем і выкарыстаннем працоўных рэсурсаў (на Беларусі — Дзярж. камітэт Савета Міністраў БССР па выкарыстанні працоўных рэсурсаў, аддзелы па выкарыстанні працоўных рэсурсаў пры аблвыканкомах, упаўнаважаныя па арганізаваным наборы і перасяленні).

Л. Я. Астроўскі. Мінск.

БІРЗНІЕК-УПІТ (Birznieks-Upītis; сапр. прозв. Бірзніекс) Эрнест Тэадоравіч (6.4.1871, хутар Бісніекі Дзярыемскай вол. Тукумскага пав. — 30.12.1960), латышскі савецкі пісьменнік. Засл. дз. маст. (1941), нар. пісьменнік (1947) Латв. ССР. З сялян. Скончыў Тукумскую гарадскую школу. Настаўнічаў. З 1893 да 1921 жыў у Закаўказзі. Друкавацца пачаў у 1890. Пісаў рэаліст. апавяданні з жыцця сялян: зб. «Апавяданні Упіта» (1900), «Зранку» (1912), «Пад вечар» (1913), «Апавяданні шэрага каменя» (1914). Зб. «У гарах Каўказа» (1924) і «Каўказскія апавяданні» (т. 1—2, 1927) — пра дружбу народаў. Напісаў шмат казак і апавяданняў для дзяцей («Казкі Ніны», т. 1—2, 1922—24; зб. «Буціс і Ула», 1924; «Старая ліпа», 1925; «Скайдрыта», 1926). Значны твор Б.-У. — аўтабіягр. трылогія «Дзённік Пастарыня» (1922—24). Адзін з першых у латышскай прозе пісаў пра рэвалюцыю 1905, намаляваў вобраз рэвалюцыянера («Пад яблыняю», «Адзін з многіх»). Пасля аднаўлення Сав. улады ў Латвіі (1940) актыўна ўдзельнічаў у літ. жыцці, друкаваў апавяданні для дзяцей («Унучка Дацэ», 1949; «Рухавы Яніціс», 1955), успаміны пра С. Шаўмяна, Дз. Мамі-на-Сібірака, Я. Райніса. Узнаг. ордэнам Леніна і ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Kopoti raksti, т. 1—7, Rīga, 1960—63; бел. пер. у кн.: Латышскія апавяданні, Мн., 1956; рус. пер. — Дневник Пастарыня, Рига, 1951; Пастарынь в школе, Рига, 1953; Рассказы серого камня, Рига, 1955.


А. Я. Вілсан. Рыга.


БІРМА, Бірманскі Саюз [на бірм. М'янма (Бама), П'ідаўнзу м'янманайнган], дзяржава ў Паўд.-Усх. Азіі. Пл. 678 тыс. *км*². Нас. 27,3 млн. чал. (1969). Сталіца Рангун.



У склад Бірманскага Саюза ўваходзяць уласна Бірма, аўт. нац. дзяржавы Кая, Катулей, Качынская, Шанская і асобная нац. акруга Чын.

Дзяржаўны лад. Б. — федэратыўная рэспубліка. Пасля дзярж. рэвалюц. перавароту (1962) дзеянне канстытуцыі 1947 прыпынена, парламент распушчаны. Усю паўнату ўлады ў краіне ўзяў на сябе Рэвалюц. савет, які


БІРМА
Маштаб 1:12 500 000
125 0 125 250 км
90°
100°
20°
16°
24°
12°
Сакхавалат
Дыбругарх
Путао
Сэнгмайдум
Ромела
Тэлгур
Брахма
Нагаленд
Шымбуган
Вакчжанг
Гувахаты
Лумдынг
Шыллонг
Сэлхет
Ячар
Імпхал
Хаумалин
Малу
Мучын
Хамтын
Кала
Бьма
Тэмчун
Яньбянь
Яшкин
Ланьнинь
Сягуань
Ляньчу Чуцюн
Юньсяньч
Агартала
Аіджал
Чандпур
Нанклан
Калін
Олдо
Калем'е
Ей
Шуабо
Тамаін
Намхам
Бумлюн
Хашо
Цинту
Пуэр
Фусінчжэнь
Сымао
Юньцзюцзун
Пхалам
Ганво
Маўмін
МАНДАЛАЙ
Сіпаін
Мрун'е
Кабмта
Мейку
Чаметун
Сіпе
Пакхоўку
М'ініджан
Лайка
Тако
Таўдзін
Намсаю
Чаметоне
Менятун
Таўнджаі
Чаўпадаун
Енанджаун
Мінбу
Магго
Янкін
Мамбй
Ядайко
Мейкоу
Енанмо
Ламу
Таўнгу
Шхесаў
Пхю
Чыннгмай
Лампанг
Пакпай
Хіктада
Ісіпхайл
Нгапхлі
РАНГУН
Пегу
Татхоўн
Пхаан
Мартама
МАЛАМ'ЯЙН
Мудоўн
Пхітсанулок
Пхічыт
Утарадыт
Сухотхаі Тхані
Нахканасаван
Чайнат
Намтокхок
Намток
Тавой
Канчанабуры
Рацбуры
БАНГКОК
Самутсакхан
Пхетбуры
Пхалі
М'єй
Бірма
МОРА
Бангалаган
Чумпхон
Кра
Малакка
Сінгапур
Андаманскае
У Ланцан
У Салуін
У Іравадзі
У Сітаўн
У Хуанхэ
У Янцзы
У Меконг
У Чао-Прая
У Мекангу
У Хуанхэ
У Янцзы
У Хуанхэ
У Янцзы
У Меконг
У Чао-Прая
У Мекангу




1,1 млн. *т* у 1965/66 да 341 тыс. *т* у 1967/68. У 1968/69 было (млн. галоў) буйн. раг. жывёлы 8,7, свіней 1,7. Есць 600 прыручаных слоноў. Малочная жывёлагадоўля развіта слаба, буйн. раг. жывёла выкарыстоўваецца як цяглавая сіла. Рыбалоўства дае каля 400 тыс. *т* рыбы за год. У прамысл. найбольш развіты галіны, якія абслугоўваюць знешні рынак,— харч., асабліва рысаачышчальная, горназдабываючая, лясная. У энергетыцы выкарыстоўваюцца нафта, каменны і буры вугаль. Здабыта ў 1968/69 нафты 724 тыс. *т*, вугалю 13 тыс. *т*. У 1968/69 вытв. эл. энергіі 442 млн. *квт·гадз*. Акрамя ЦЭС у Рангуне і Мандалаі, некалькі невялікіх ГЭС. Здабыта (1968/69) волава 290 *т*, цынку 9,0 тыс. *т*, свінцу 9,5 тыс. *т*, вокісу вальфраму 108 *т*. Серабра ў 1967/68 здабыта 780 тыс. унцый. Асн. цэнтры здабычы: Бадуін і Лашо на ПнУ і Мачы на У. На Пн ад Мандалая здабываюць рубіны і сапфіры. Б. займае 1-е месца ў свеце па нарыхтоўцы каштоўнай цікавай драўніны. Штогод нарыхтоўваецца каля 1,4 млн. $м^3$ драўніны, з іх каля 0,3 млн. $м^3$ ціку. Больш за палову прамысл. прадпр. і рабочых Б. заняты ачысткай рысу. Тэкст. прадпр. ў Рангуне, Мандалаі. Металургічны з-д у Намту. Есць прадпр. па трактара-, аўта- і велазборцы, перапрацоўцы арахісу, чаю, кавы, джуту; цэментныя заводы і цагельні. Саматужная вытв. тканін, с.-г. прылад, вырабаў з дрэва, слановай косці, серабра. Даўж. (1969, тыс. *км*) чыгунак 4,1, суднаходных рэк і каналаў больш за 8, аўтамаб. дарог 25,6, у т. л. 11 з цвёрдым пакрыццём. Гал. порт і аэрапорт Рангун. Асн. экспарт — рыс, драўніна каштоўных парод, канцэнтраты і руды каляровых металаў. Імпарт — машыны, прамысл. абсталяванне. Асн. гандлёвыя партнёры: Вялікабрытанія, Японія, Індыя, ФРГ, ЗША. Грашовая адзінка — джа (к'ят).

Узброеныя сілы складаюцца з сухап. арміі (у дывізіі і брыгады ўваходзяць пяхотныя і бранятанкавыя батальёны, артыл. дывізіёны, падраздзяленні спец. войск), ВПС (у 1967 — больш за 100 самалётаў) і ВМС (у 1966 — каля 70 баявых караблёў, пераважна рачных). Узначальваюцца старшынёй Рэвалюц. савета. Камплектуюцца па найме тэрмінам на 6 гадоў. Маюць (1970) больш за 137 тыс. чал., з іх у сухап. войсках больш за 120 тыс., у ВПС і ВМС па 7 тыс. чал.

Ахова здароўя. Мед. абслугоўванне дзяржаўнае, страхавое і прыватнае. У 1969 было 346 бальніц на 19,7 тыс. ложкаў (0,7 ложка на 1000 чал. насельніцтва). З дапамогай СССР у г. Таўнджы пабудаваны шпіталь на 200 ложкаў з паліклінікай. Урачоў 2,2 тыс. (1 на 12,5 тыс. чал.) на дзярж. службе і 328, якія займаюцца прыватнай практыкай, 4868 акушэрак і медсясцёр. Кадры рыхтуюць 3 мед. ін-ты і мед. каледж. У 1968 нараджальнасць 40,4, смяротнасць 12,9 на 1000 чал.; дзіцячая смяротнасць 66,5 на 1000 жыванароджаных. Сярэдняя працягласць жыцця 44 гады. Найбольш пашыраны інфекцыйныя і паразітарныя хваробы, хваробы страўнікава-кішачнага тракту, туберкулёз, трахома.

шчы. Пры асваенні новых зямель арганізоўваюцца кааператывы. Есць дзяржгасы, 88 МТС маюць больш за 6,8 тыс. трактароў (1969). Гал. раён с. гасп.— даліна, асабліва дэльта Іравадзі. З усіх с.-г. зямель (16 млн. *га*) апрацоўваецца 8,7 млн. *га* (1968/69), частка зямель засяецца два разы на год. Асн. галіна с. гасп.— земляробства. Гал. культура — рыс. У 1969 пад рысам было 4961 тыс. *га* (сабрана 7896 тыс. *т*), пад пшаніцай 60,4 тыс. *га* (25,4 тыс. *т*). Вырошчваюцца (1969) земляны арэх — 604 тыс. *га* (392 тыс. *т*), кунжут — 814,8 тыс. *га* (82 тыс. *т*), бавоўнік — 115,6 тыс. *га* (32 тыс. *т* семя), цукр. трыснёг — 64,8 тыс. *га* (1287 тыс. *т*), джут, кенаф, тытунь, перац, бульба, кава, чай. У 1965/66 пад просам 168 тыс. *га* (45 тыс. *т*), гарохам 116 тыс. *га* (48 тыс. *т*). 3% апрацаваных зямель пад цытрусавымі, манга, бананамі, ананасамі. Экспарт рысу, які звычайна даваў амаль 80% усіх валютных паступленняў, скараціўся з



Ворыва пад рыс у Ніжняй Бірме.

Асвета. У калан. перыяд большасць насельніцтва было непісьменнае, навучанне ў школах вялося пераважна на англ. мове. Пасля завяавання незалежнасці прынята рашэнне пра ліквідацыю непісьменнасці і паступовы пераход да ўсеагульнага бясплатнага навучання. Створана адзіная цэнтралізаваная школьная сістэма; большасць школ дзяржаўныя. Навучанне раздзельнае (у асобных школах — сумеснае), на бірм. мове (на нац. ускраінах — на мясцовых мовах). Пач. школа 4-гадовая (для дзяцей ад 6 да 10 гадоў). Навучанне ў дзярж. пач. школах бясплатнае (з 1951). У 1968/69 навучальным годзе ў пач. школах вучылася 3 млн. дзяцей. Сярэдняя школа (на базе пач. школы) мае 2 ступені, кожная з 3-гадовым навучаннем. Школы малодшай ступені (прамежкавыя) рыхтуюць вучняў да паступлення ў школы старэйшай ступені і да практ. дзейнасці. Школы старэйшай ступені падзяляюцца на агульнаадук. (акадэмічныя), с.-г. і тэхн. У 1966/67 навуч. г. ў 1322 сярэдніх школах абедзвюх ступеняў займалася 945 532 вучні. Школ і настаўнікаў не хапае. ВНУ: ун-ты ў Рангуне і Мандалаі, тэхналаг. ін-т (пабудаваны з дапамогай СССР), 3 мед. ін-ты, ін-ты зубатэхн., пед., эканомікі, замежных моў, па падрыхтоўцы настаўнікаў пач. і сярэдніх школ нац. раёнаў, с.-г., ін-т жывёлагадоўлі і ветэрынарыі. У 1966/67 навуч. г. ў ВНУ вучылася 29 534 студэнты. Найбольшыя б-кі: Рангунскага ун-та і ун-та ў Мандалаі. З 7 музеяў найб. вядомыя: Нац. музей і Нац. маст. галерэя ў Рангуне. У 1910 засн. Навукова-даследчае т-ва.


Друк, радыё. У 1969 выдавалася 8 штодзённых газет тыражом 200 тыс. экз.: на бірманскай і англ. мовах — асн. орган Рэвалюц. савета «Люду піду найзін» («Рабочы народ»), на бірманскай мове — «Бататаўн» («Авангард»), на англ. мове — «Guardian» («Вартавы») і інш. Інфармацыйнае Агенцтва Бірмы (НАБ) у Рангуне (засн. ў 1963). Радыёвяшчанне з 1938.

Літаратура. Станаўленне бірм. л-ры адбываецца ў 9—13 ст. У 11 ст. адна з сярэдневяковых інд. моў — палі — становіцца рэліг., дзелавой і літ. мовай (побач з п'ю, монскай і бірманскай). У 14—16 ст. дасягнула росквіту бірм. класічная паэзія (рэліг. паэмы Шын Махатылавунты, Шын Махарататары, Шын Утамаджо, Шын Оўн Ньёў). Вядомыя паэты 16—17 ст.— Навадэйджы, Натшынаўн, Таўнбіла Схандо. Узор прозы 18 ст.— пераклад 8 джатакаў (жанр стараж.-інд. л-ры) У Обата. З джатакамі звязаны сюжэты твораў класікаў бірм. драмы (У Чын У, У Пон Ня). У пач. 20 ст. ў бірм. л-ры ўзнік жанр рамана (Джэймс Хла Джо, У Джы, У Лат). Пачынальнік сучаснага бірм. рамана — Пі Моў Нін. Сац. тэмы распрацоўваў Маха Схвей. Патрыят. рух за нац. незалежнасць узначаліў пісьменнік Такін Кода Хмайн. Сярод пісьменнікаў 1-й пал. 20 ст. вылучаліся У Маўн Джы, М'я М'ёў Лвін, У Ба Чхоў, Тэйн Цхей М'інт, Зоджы (У Тэйн Хан), Міндувун, Зел, У Ян Аўн. Пасля ўтварэння незалежнай Б. паэты Дагоўн Тая, Даўн Нве Схвей, Ней Твей Ні, Тын Моў, празаікі Янгоўн Ба Схвей, Ма Ма Ле, Тэкадоў Боў Хпайн, Кхін Хпін Ю, Бан Мо Тын Аўн, Аўн Лін, выкарыстоўваючы лепшыя нац. традыцыі і вопыт сусв. л-ры, узнімаюць надзённыя сац. і маральна-этычныя праблемы. Пасля 2-й сусв. вайны перакладзены на бірм. мову творы рус. і сав. пісьменнікаў (перакладчыкі Коў Коў Джы, М'я Тан).

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Найб. ранніх помнікі мастацтва на тэр. Б. (выявы жывёл, магічныя знакі ў пячорах каля Таўнджы) адносяцца да неаліту. У пач. н. э. паявіліся дзяржавы і гарады (Пейтано, каля сучаснага г. Таўнджы; Таяметаў, ці Шрыкшэтра, каля П'і; Халін каля Шуэбо). Росквіт арх. і мастацтва прыпадае на 11—13 ст.— перыяд стварэння дзяржавы з цэнтрам Паган. Сталіца, дзе захавалася больш за 5000 манумент. збудаванняў, была абкружана ровам і абнесена арыентаванай на кірунк свету сцяной з варотамі і вежамі. У цэнтры Пагана сталў палац. Агульная плошча горада 1,5 $км^2$, у плане бліжкая да квадрата. Падобная гарадаўтваральная структура далей развівалася ў гарадах Ава (14 ст.), Новы Пегу (14—17 ст.), Амарапура (18 ст.), Мандалай (19 ст.). Асн. помнікі Пагана: звонападобныя трохчасткавыя са шпілем дагобы (гл. *Ступа*)— Лакананда (1059), Мінгалазеды (1274—84), Шуэзігоўн (Швезігон, 1084—1113); цэнтрычныя храмы — Дхамаянгі (1160), Нагаён (паміж 9 і 12 ст.), Ананда [выдатны помнік архітэктуры, 1083—91, пабудаваны ў выглядзе ступеньчатага крыжа: аснова (*м*) 175×175, асн. масіў 91×91, выш. 51,5 *м*], Табінью («гіганцкі» двух'ярусны храм, 1144), палацавыя комплексы, валы пасвячэнняў, сховішча рукапісаў, манастыры — прамавугольныя ў плане, з галерэямі, шмат'ярусным дахам ці скляпеністай столлю. Манумент. характар архітэктуры, які спалучаецца з багаццем і складанасцю формаў, разнастайнасцю аздобы (пазалота, ажурнае жалеза, шкляная мазаіка, керамікa, арнаментальны і геам. рэльеф), сінтэз архітэктуры, скульптуры і жывапісу (насценныя рэльефы, фрэскі, размаляваная скульптура, аздобленая каштоўнымі камянямі) уласцівыя і больш позняй бірманскай архітэктуры і мастацтву (пагада Шуэдагоўн, ці Шведагон, у Рангуне, 14 ст., перабудоўвалася да 1774, і інш.). У калан. перыяд (1886—1948) нац. мастацтва было ў загоне. У канцы 19 ст. ўзнік рэаліст. жывапіс (У Чоўн). У 20-я г. 20 ст. У Ба Н'ян і У Ба Зо пачалі пісаць алеем (пейзажы, партрэты, жанравыя карціны). Пасля завяавання незалежнасці адраджаюцца нац. традыцыі, пашыраюцца рамёствы: разьба па дрэве і косці, чаканка і гравіроўка па метале, чорна-залаты лакавы роспіс і інш. Пачалося буд-ва грамадскіх і прамысл. жалезабетонных будынкаў, жылых дамоў, школ. У 1950 у Рангуне збудаваны манумент Незалежнасці (выш. 46,7 *м*), «Пагада Міру» (1950—52), ансамбль інжынернага каледжа (1954—56). З дапамогай Сав. Саюза ў Рангуне ў 1958—61 пабудаваны тэхналагічны ін-т, атэль «Інья» і інш.

Храм Ананда ў Пагане. 1091.





Будынак адміністрацыі і бібліятэкі інжынернага каледжа (злева). Тэхналагічны інстытут у Рангуне.

Пашыраецца акварэльны пейзаж і кніжная графіка (У Маўн Джо, У Аўн Со, У Оўн Луін). У станковым і манумент. жывапісе гал. ролю адыгрывае рэаліст. кірунак на чале з У Ба Джы. У 1964 узнікла Т-ва жывапісцаў і скульптараў (У Сан Він, У Кін Маўн, У Аўн Кін, У Лвін, У Хан Тын).


Музыка Б. развілася в рэліг. рытуалу, цесна звязана з танцам і т-рам. Важнае месца яна заняла ў будыйскай культуры перыяду Паганскай дзяржавы. Пасля падзення Пагана вылучаецца свецкае муз. мастацтва (спевы і танцы ў палацавых цырымоніях). На пач. 16 ст. сфарміраваўся характэрны Б. тып аркестра, т. зв. сайн, у якім пераважаюць ударныя інструменты. Паступова ўсё большае месца займае музыка ў пар. тэатр. паказах (арк. ўступы, песенна-танц. інтэрмедыі паміж дзеямі). У сярэдзіне 18 ст. бірманская музыка вазнала ўплыў сіямскай культуры. Пасля ўтварэння незалежнай рэспублікі развіваецца прафесіян. муз. мастацтва; арганізаваны дзярж. школы музыкі і драмы ў Рангуне і Мандалаі, Дзярж. аркестр Б. на чале з кампазітарам У Хан Па (у 1956 гастраліраваў у СССР).

Тэатр. Вытокі нар. т-ра ў рэліг. і нар. святкаваннях. Пра тэатр. паказы ўпамінаецца ў 11 ст. Асн. жанры — «пібаткінг» (містэрыя з казачным і рэліг. сюжэтам, з 15 ст.), «нандвінза» (дварцовая драма на тэмы інд. эпасу «Рамаяна», з сярэдзіны 18 ст.), «п'яза» (драм. апавяданне, 19 ст.). У 20-я г. 20 ст. ўпершыню пастаўлены замежныя класічныя творы. Пасля 1948 у гарадах створаны пастаянныя тэатр. трупы, у вёсках — аматарскія. Тэатр. паказы складаюцца з элементаў драмы, оперы і балета, асн. месца належыць музыцы. Існуе т-р марыянетак (з 16 ст.), т-р ценяў. Працуюць прыватныя тэатр. школы.

Кіно. У 1914 У Оп Маўн заснаваў першую ў Б. кінафірму «Бірма фільм компані» (Рангун). У 1920 пастаўлены першы маст. фільм «Каханне і алкаголь», у пач. 30-х г.— гукавыя фільмы «Грошы нельга купіць», «Прынц з Асама» і інш., аднак «нямыя» фільмы займалі вялікае месца ў кінавытворчасці да пач. 50-х г. У 2-ю сусв. вайну і ў час яп. акупацыі выпуск фільмаў спыніўся; адноўлены ў 1946. Пасля 1948 многія фільмы паказваюць барацьбу народа супраць каланізатараў, заклікаюць да нац. адзінства і салідарнасці. У Б. створаны Савет па пытаннях кіно (1962), Упраўленне па справах кінематаграфіі (пры ім кінастудыя дакумент. фільмаў). Працуе (1969) больш за 400 кінатэатраў, частка з іх нацыяналізавана (1968). Штогод выпускаецца каля 60 маст. фільмаў.

Літ.: Маркс К. Война в Бирме.— Русский вопрос.— Любопытная дипломатическая переписка, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 9; Энгельс Ф. Бирма, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 14; Не Вин. Бирма на новом пути, М., 1965; Васильев В. Ф. Очерки истории Бирмы. 1885—1947, М., 1962; Козлова М. Г. Бирма накануне английского завоевания, М., 1962; Куракова Л. И. Бирма. Природные районы и ландшафты, М., 1967; Васильев В. 20 лет независимости, «Азия и Африка сегодня», 1968, № 1; Цена любви. Рассказы бирманских писателей, М., 1963; Это случилось в полнолуние. Новеллы бирманских писателей, [пер. з бірм.], М., 1965; Попов Г. П. Бирманская литература, М., 1967; Индия и Бирма, М., 1954 (Ученые записки Ин-та востоковедения, т. 10); Всеобщая история искусств, т. 2, кн. 2, М., 1961, с. 280—287; там жа, т. 6, кн. 1, М., 1966, с. 442—443; Прокофьев О. С. Искусство Юго-Восточной Азии, М., 1967, с. 99—123; Чжу Чжихэ. Бирма, пер. с кит., М., 1958; Ожегова Н. Лаковая миниатюра Бирмы, «Искусство», 1966, № 12; Ожегов С. С. Архитектура Бирмы, М., 1970. *І. Я. Афнагель* (прырода), *А. Я. Пейсаховіч* (гістарычны нарыс). Мінск; *Л. І. Яўстаф'ева* (насельніцтва, гаспадарка), *А. А. Западава* (літаратура), *Т. С. Праскурякова* (архітэктура, выяўленчае мастацтва), *Л. Р. Чудава* (музыка). Масква.

У. Оўн Луін. Мір і дастатак. Малюнак тушшу. 1959.



БІРМАНСКАЯ МОВА, належыць да тыбецка-бірманскай групы *кітайска-тыбецкіх моў*. Падзяляецца на тры блізкія між сабою дыялекты: цэнтральны, араканскі і тавойскі. На Б. м. гаворыць больш за 16 млн. чал. Мае 11 галосных, 33 зычныя фанемы і з'яўляецца тонавай мовай з аднаскладовай будовай кораня. Асн. спосабы словаўтварэння — словаскладанне і афіксацыя аглюцінатыўнага тыпу. У марфалогіі вылучаюцца іменныя і дзеяслоўныя класы слоў, а таксама службовыя словы, якія разам з парадкам слоў выражаюць сінтакс. адносіны. Пісьмовыя і літ. традыцыі грунтуюцца на інд. узорах і бяруць пачатак у 11 ст.

Літ.: Маун Маун Ньун и др. Бирманский язык, М., 1963 (бібліягр.).

БІРМІНГЕМ (Birmingham), горад Вялікабрытаніі ў цэнтральнай частцы Англіі. Першыя звесткі пра Б. адносяцца да 11 ст. Вузел чыгунак і суднаходных каналаў. Аэрапорт. 2425 тыс. ж. (1968, з прыгарадамі). Цэнтр аднаго з важных раёнаў чорнай металургіі, металаапрацоўкі, маш.-буд., эл.-тэхн. і ваеннай прамысловасці. Вытв. рухавікоў, аўтамабіляў, матацыклаў, веласіпедаў, цеплавозаў і вагонаў, металічных і пластмасавых вырабаў шырокага ўжытку, інструменту, фарбаў. Гумавая прамысл. Самая вял. ў свеце кавашакаладная ф-ка. Ун-т (з 1900) з цэнтрам даследаванняў у галіне электронікі і атама. Маст. галерэя.

БІРОНАЎШЧЫНА, рэакцыйны рэжым у Расіі ў 30—40-я г. 18 ст., назва ад прозвішча фаварыта імператрыцы *Ганны Іванаўны* Эрнста Іагана Бірона (1690—1772), які фактычна сканцэнтраваў у сваіх руках усю ўладу ў краіне. Характэрным Б. было засілле інашаземцаў ва ўсіх кіруючых установах, раскраданне дзярж. сродкаў, сістэма шпіянажу, даносаў, рэпрэсій, узмацненне феад.-прыгоннага ўціску. Пасля смерці Ганны Іванаўны Бірон пазбаўлены ўсіх пасад.

Літ.: Строев В. Бироновщина и Кабинет министров. Очерк внутренней политики императрицы Анны, ч. 1—2, М.— СПб., 1909—10.

БІРС (Bierce) Амбраз Гвінет (24.6.1842, Хорс-Кейв-Крык, штат Агайо — каля 1914), амерыканскі пісьменнік. Сын фермера. Першыя аб. сатыр. апавяданняў надрукаваны ў 70-я г. ў Лондане пад псеўд. Дод Грайл. У 1891 выйшаў аб. апавяд. «У гушчы жыцця». У аб. «Ці можа гэта быць?» (1893) і «Фантастычныя байкі» (1899) гратэск і рамантычная фантастыка набываюць псіхалаг. і сац. канкрэтнасць. Напісаныя ў традыцыях Э. *По* «страшныя апавяданні» Б. паказваюць адзіноту чалавека ў бурж. гр-ве. У многіх творах адлюстраваў эпапею грамадз. вайны 1861—65, у якой удзельнічаў на баку рэспубліканцаў. Сатыр. «Слоўнік сатаны» (1911, 1-е выд. «Лексікон цыніка», 1906) высмейвае бурж.-абывацельскі светапогляд. У 1913 паехаў у Мексіку ваенным карэспандэнтам і загінуў без вестак.

Тв.: Рус. пер.— Рассказы, М., 1938; Словарь сатаны и рассказы, М., 1966.

Літ.: Кашкин И. Для читателя-современника, М., 1968.

БІРУЗА (перс. фірузе), мінерал, складаны водны фасфат алюмінію і медзі $CuAl_6[OH]_8[PO_4]_4 \cdot 5H_2O$. Крышталі трыкліннай сістэмы, звычайна скрытакрышталічныя масы з ракавістым зломам. Крохкі. Колер блакітны, блакітна-зялёны. Бляск васковы. Цв. 5—6; шчыльн. 2600—2830 *кг/м*^{3}. Трапляецца ў кварцавых пражылках, часам у змененых вулканічных пародах. Каштоўны камень. Радовішчы ў СССР, Іране і інш.

БІРУЗОВА, вёска ў Парэцкім с/с Расонскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Расонскі». За 5 *км* на ПдУ ад Расонаў, 165 *км* ад Віцебска, 48 *км* ад чыг. ст. Дрэтунь. 277 ж., двароў 92 (1970). Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад і яслі, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін.

БІРУЗОЎ Сяргей Сямёнавіч [8(21).8.1904, г. Скапін Разанскай губ.— 19.10.1964], савецкі ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1955). Герой Сав. Саюза (1958). З рабочых. Чл. КПСС з 1926. У Чырв. Арміі з 1922. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1937). У Айч. вайну камандуючы арміі, нач. штаба 4-га, 3-га Укр. франтоў. У 1941—42 удзельнічаў у арганізацыі абарончых баёў на Паўд.-Зах. і Бранскім франтах, у Сталінградскай бітве; у чэрв. 1943 — у Міускай аперацыі і ў аперацыі на р. Малочная; у 1944 — у распрацоўцы і ажыццяўленні Яса-Кішынёўскай аперацыі; у вызваленні Югаславіі. У 1946—47 нам. галоўнакамандуючага Паўд. групы сав. войск і нам. старшыні Саюзнай кантрольнай камісіі ў Балгарыі. З 1947 камандаваў войскамі ваен. акругі; з 1955 нам. міністра абароны; з 1963 нач. Ген. штаба Узбр. Сіл СССР. Чл. ЦК КПСС з 1961. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—6-га скл. Аўтар мемуараў па гісторыі Айч. вайны; адзін з аўтараў і адказны рэд. кнігі «Савецкія ўзбр. сілы ў барацьбе за вызваленне народаў Югаславіі» (1960).



БІРУКОЎ Адам Андрэевіч [н. 8(21).11.1914, в. Ядроная Слабада Бабруйскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Гомельскі заатэхнікум (1936), настаўніцкі ін-т (1940). З вер. 1940 першы сакратар Рагачоўскага райкома ЛКСМБ. З жн. 1941 на акупаванай тэр. ў паўн. раёнах Гомельскай вобл., кіраваў работай падпольных камсамольскіх арг-цый. З кастр. 1941 узначальваў партыз. групу, якая ператворана ў партыз. атрад № 255; Б. стаў яго камісарам. З 22.2.1943 камісар *партызанскай брыгады 8-й Рагачоўскай*; з жн. 1943 сакратар Пінскага падпольнага абкома ЛКСМБ. Скончыў школу парт. арганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1947). На парт. і гасп. рабоце. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Советские партизаны, 2 изд., М., 1963; Щербатов Г. Комсомол Белоруссии в боях за Родину, М., 1949.

БІРУКОЎ Іван Сямёнавіч (6.10.1918, в. Масолаўка Тамбоўскага пав.— 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС. На фронце з мая 1941, камандзір батальёна. Вызначыўся ў баях пры прарыве абароны праціўніка каля в. Сіроціна Віцебскай вобл. і 24.6.1944 пры фарсіраванні Зах. Дзвіны. Загінуў у баі.

БІРУЛІН Міхаіл Фёдаравіч [н. 14(27).9.1914, в. Любяціна Веліжскага пав. Віцебскай губ.], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Напярэдадні вайны працаваў бухгалтарам у калгасе «Бальшавіцкі шлях» Віцебскага р-на, з 1939 старшыня Бараўлянскага с/с Віцебскай вобл. З 9.7.1941 камандзір дыверсійнай групы, з 2.2.1942 — партыз. атрада, з 1.2.1943 — *партызанскай брыгады 1-й Віцебскай*. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце. Узнаг. 5 ордэнамі. Жыве ў Віцебску.

БІРУТА [сапр. Амелія Даравінская (Derewińska); 1863, Ройсталі каля Вільні — 27.7.1891], беларуская і польская фалькларыстка і этнограф. Адукацыю атрымала ў Варшаве. Настаўнічала, запісвала бел. фальклор і праводзіла этнагр. даследаванне Лідскага пав. Друкавацца пачала ў 1889 у час. «Wisła» («Вісла»), дзе змясціла апісанне дажынак (з дажынкавымі песнямі) у Шаўрах Лідскага пав., некалькі бел. паданняў. Найбольш значная публікацыя — «Беларускія песні з Лідскага павета» (1892). Этнагр. манаграфію Б. «Апісанне Лідскага павета» цэнзура не прапусціла ў друк. Частка яе рукапісаў у архівах Варшавы і Вільнюса.

Літ.: Саламевіч Я. Даследчыца беларускага фальклору, «Полымя», 1969, № 11.

БІРУЧЫНА (Ligustrum), род кустоў і невялікіх дрэў сям. маслінавых. Сцябло галінастае, выш. 1—5 *м*. Лісце ланцэтнае. Кветкі белыя, духмяныя. Суквецце — мяцёлка ці гронка. Плады — бліскучыя чорнасінія ягады, выспяваюць у кастр. і астаюцца на кустах амаль да вясны. Вядома каля 30 відаў, пашыраных у Еўропе, Паўн. Афрыцы, М. Азіі. У СССР 4 віды (дзіка растуць па берагах рэк і ў лясах зах. абласцей Украіны, Малдавіі, у прычарнаморскіх стэпах, у горным Крыме на Каўказе); у



Біручына звычайная: *1* — галінка з кветкамі; *2* — галінка з пладамі.

БССР — Б. звычайная (L. vulgare). Культывуецца як дэкаратыўная для жывых агароджаў і бардзюраў, добра пераносіць абстрыгание. Размнажаецца насеннем, атожылкамі, чаранкамі. Меданос. З драўніны робяць шавецкія цвікі, дробныя такарныя вырабы; сокам з пладоў закрашваюць віно, фарбуюць тканіны.


Літ.: Деревья и кустарники СССР, М., 1966.

БІРЫЛА Мікалай Васілевіч (н. 10.9.1923, в. Скварцы Мінскага пав.), беларускі савецкі мовазнавец. Д-р філал. н. (1969). Чл. КПСС з 1961. З сялян. У Айч. вайну быў партызанам. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1947). З 1947 у Ін-це мовазнаўства АН БССР. Даследуе бел. дыялекталогію, фанетыку і анамастыку. Сааўтар прац: «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (кн. 1, 1961), «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963), «Нарысы па беларускай дыялекталогіі» (1964), «Лінгвістычная геаграфія і грунтоўскія элементы ў беларускай анамастыцы» (1968).

Тв.: Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў (рускай, украінскай, польскай), Мн., 1963; Беларуская антрапанімія, Мн., 1966; Беларуская антрапанімія. Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі, Мн., 1969.

БІРЫЛА Сцяпан Сцяпанавіч [н. 1(14).8.1903, Мінск], беларускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1955). Чл. КПСС з 1943. З 1918 працаваў у т-рах Волагды, Архангельска, Гомеля, Віцебска. З 1926 у Бел. трэцім дзярж. драм. т-ры, з 1928 у т-ры імя Я. Купалы. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Сцэнічныя вобразы Б. вызначаюцца дакладным знешнім малюнкам, псіхалагічнай распрацоўкай. Сярод роляў: Лютынскі («Канец дружбы» К. Крапівы), Якаў («Апошнія» М. Горкага), Паляжаеў («Неспакойная старасць» Л. Рахманава), Акаёмаў («Машачка» А. Афінагенава), Хірт («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона), Ксанф («Ліса і вінаград» Г. Фігейрэду), Гудзееў, Глуздакоў («Каб людзі не журыліся», «Лявоніха на





С. С. Бірыла ў ролях Ксанфа і Якава.

арбіце» А. Макаёнка). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Сабалеўскі А. Нястомны дзеяч сцэны, у зб.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960. *А. В. Сабалеўскі.* Мінск.

БІРЫЧ Таццяна Васілеўна [н. 28.12.1904 (10.1.1905), в. Лошніца Барысаўскага пав. Мінскай губ.], беларускі афтальмолаг. Д-р мед. н. (1948), праф. (1948). Чл. КПСС з 1930. Засл. ўрач БССР (1948), засл. дз. нав. БССР (1968). Скончыла мед. ф-т БДУ ў 1928. З 1945 заг. кафедры вочных хвароб Мінскага мед. ін-та. Асн. працы па оксігенатэрапіі хвароб вачэй, лячэнні туберкулёзу вачэй, выдаленні катаракты з дапамогай нізкіх тэмператур. Гал. афтальмолаг рэспублікі, старшыня навук. т-ва афтальмолагаў БССР. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл., нам. старшыні Вярх. Савета БССР (1963—67). Узнаг. 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Профилактика и лечение некоторых глазных болезней, Мн., 1955; (разам з Д. В. Кантарам) Глаукома и предупреждение слепоты, Мн., 1963; і х ж а. Особенности зрения человеческого глаза и очки, Мн., 1968.

Літ.: Татьяна Васильевна Бирич, «Здравоохранение Белоруссии», 1965, № 1. *Т. І. Кручох.* Мінск.

БІРЫЧЭЎСКІ Аляксей Іванавіч [н. 17.2 (2.3).1914, Вялікі Усцюг Валагодскай губ.],

рускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1968). У 1932 скончыў тэатр. студыю ў Архангельску. Працаваў у т-рах Вялікага Усцюга, Калініна, Ціраспаля і інш. З 1950 у Гродзенскім рус. драм. т-ры. Выканаўца характарных роляў. Сярод значных: Ахаў («Мінулася кату масленіца» А. Астроўскага), Галавасцікаў («Варвары» М. Горкага), Снапок («Калі зацвітаюць сады» В. Палескага), Швагераў («Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна), Гардзей Кічыгін («Шануй бацьку свайго» В. Лаўрэнцьева), Патапаў («Цяжкае абвінавачанне» Л. Шэйніна).

БІСАЎ (Bissau, Bissão), горад, адм. ц. (з 1941) і порт Партугальскай Гвінеі. Аэрапорт. Каля 30 тыс. ж. (1966). Ачыстка рысу, ганчарныя прадпр. Вываз пальмавых арэхаў, алею, копры, арахісу, каштоўнай драўніны, жывёлы. Назва горада ўжываецца як другая назва краіны.

БІСЕР (ад араб. бусра, мн. лік бісер — шклярус), шкляное ці металічнае зерне са скразной адтулінай для ніткі. У дэкар.-прыкладным мастацтве мінулага з Б. рабілі дэкар. пано і аздаблялі бытавыя рэчы — кашалькі, сумкі, чахлы да цыбукоў і інш. Найлепшыя вырабы з Б. ў Расіі і на Беларусі створаны ў 18 — пач. 19 ст. Цяпер Б. выкарыстоўваюць найбольш у каралях і для вышыўкі адзення і галаўных убораў.

Літ.: Червлюков А. Ф. Шитье бисером и стеклярусом, у кн.: Русское декоративное искусство, т. 3, М., 1965.

БІСКАЙСКІ ЗАЛІЎ (франц. Golfe de Gascogne; ісп. Golfo de Vizcaya), заліў Атлантычнага акіяна паміж паўн. берагам Іспаніі і зах. берагам Францыі. Пл. 194 тыс. *км²*. Глыб. да 5098 *м*. Частыя штормы. Прылівы паўсутачныя, выш. да 6,7 *м*. Рыбалоўства. Асн. порты: Брэст, Сен-Назер, Ла-Рашэль (Францыя), Сан-Себасцьян, Сантандэр (Іспанія).

БІСКУПІНСКАЕ ГАРАДЗІШЧА, адно з найбольш даследаваных гарадзішчаў позняга бронзавага і ранняга жалезнага вякоў у Польшчы. На зах. беразе Біскупінскага воз., за 35 *км* на Пн ад г. Гнезна. Адносіцца да *лужыцкай культуры*. Раскопкі вядуцца з 1935. У тарфяніках добра зберагліся асновы драўляных абарончых сцен з варотамі, некалькі дзесяткаў доўгіх дамоў, лодкі, часткі калясніц і прылады працы: саха, рыбалоўныя сеткі, ткацкія станкі, лук і інш. Знойдзены скіфскія рэчы. Жыхары Б. г. жылі вялікімі патрыярхальнымі сем'ямі, займаліся жывёлагадоўляй, земляробствам, паляваннем, рыбалоўствам. Каля Б. г. могільнік з трупаспаленнем. Б. г. пабудавана на больш ранніх стаянках — эпохі мезаліту, неаліту і бронзы. На месцы раскопак створаны археал. музей.

Л. Д. Побаль. Мінск.

БІСМАРК Шонгаўзен фон (von Bismarck-Schönhausen) Ота (1.4.1815—30.7.1898), германскі дзярж. дзеяч, князь. У 1859—62 пасланнік Прусіі ў Расіі, у 1862 у Францыі. З 1862 міністр-прэзідэнт і міністр замежных спраў. Правёў рэформу, якая ўмацавала ваен. магутнасць Прусіі. Арганізатар многіх ваен. канфліктаў. У выніку *дацкай вайны 1864, аўстра-прускай вайны 1866, франка-прускай вайны 1870—71* закончыў мілітарысцкае аб'яднанне Германіі. У 1871—90 рэйхсканцлер Германскай імперыі. Садзейнічаў разгрому *Парыжскай камуны 1871*. З дапамогай *Выключнага закону супраць сацыялістаў* (1878—90) беспаспяхова спрабаваў задушыць рабочы рух у Германіі. Праводзіў палітыку анямечвання польск. насельніцтва, захопу калоній у Афрыцы. Дамогся стварэння *Траістага саюза* (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія). Імкнуўся аслабіць Расію, сутыкнуць яе з Англіяй, ізаляваць Францыю, аднак не змог перашкодзіць руска-франц. збліжэнню. Няўдачы ў барацьбе з рэвалюц. рабочым рухам і ў знешняй палітыцы прывялі да адстаўкі Б. ў 1890.

Літ.: Ерусалимский А. С. Бисмарк: дипломатия и милитаризм, М., 1968.

БІСМАРКА АРХІПЕЛАГ, група астравоў у Ціхім акіяне. Частка падапечнай тэр. ААН Новая Гвінея (пад кіраўніцтвам Аўстрал. Саюза). Пл. 50 тыс. *км²*. Два вялікія а-вы (Новая Брытанія і Новая Ірландыя, выш. да 2300 *м*) і шмат малых — вулканічныя або караллавыя. Клімат экватарыяльны. Нас. 188 тыс. чал. (1965). Земляробства і рыбалоўства. Здабыча жэмчугу. Гал. горад і порт Рабаўл.

БІТУМІНОЗНЫЯ ПАРОДЫ (ад лац. bituminosus смалісты), асадкавыя горныя пароды (пяскі, пясчанікі, вапнякі і інш.), у якіх ёсць прыродны бітум. Найчасцей *бітумы* з'яўляюцца астаткавай змененай нафтай, якая бывае ў рассеяным стане або ў выглядзе ўключэнняў у шчылінах, пустотах ці насычае пароду ў порах. Часам бітуміназнымі наз. пароды з першасна асадкавымі слаямі, праслойкамі і лінзамі арган. рэчыва сапрапелевага паходжання (больш правільная іх назва *гаручыя сланцы*). У СССР Б. п. ёсць у Эстоніі, Паволжы, Заволжы і інш. месцах, на Беларусі ў Прыпяцкім сланцавым басейне. Выкарыстоўваюцца для атрымання бітумаў, газу, вадкага паліва і хім. прадуктаў.

БІТУМЫ (лац. bitumen горная смала), агульная назва газападобных, вадкіх і цвёрдых рэчываў ці прадуктаў іх перапрацоўкі, якія складаюцца з вугляроду і вадароду, а часта з серы, кіслароду і азоту і растваральніках. Бываюць прыродныя і штучныя. Па паходжанні Б.— састаўная частка каўстабіялітаў (сапрапеліты, гуміты і нафтавыя Б.), асадкавых горных парод, глебы, раслінных і жывёльных рэчываў. Найбольшае прамысл. значэнне маюць нафтавыя Б.— сумесь парафінавых, нафтанавых, араматычных вуглевадародаў і сярністых, кіслародных і азоцістых арган. злучэнняў.

Пры пераходзе ад газападобных нафтавых Б. да вадкіх і цвёрдых мяняюцца адносіны паміж элементамі, в якіх складаюцца Б., павялічваецца малекулярная маса кампанентаў і ўскладняецца іх будова. Таму вадкія і цвёрдыя Б. звычайна характарызуюцца наяўнасцю маслаў, смолаў, асфаль-

тагенавых к-т і іх ангідрыдаў, асфальтэнаў, карбенаў, карбоідаў і парафінаў, якія адрозніваюцца паводле растваральнасці ў арган. растваральніках і сваёй канспістэнцыі.

Б. ў тэхніцы — будаўнічы матэрыял. Адрозніваюць прыродныя (ужываюцца рэдка) і нафтавыя, якія атрымліваюць з рэшткаў прадуктаў перагонкі нафты. Воданепранікальныя, устойлівыя супраць кіслот, шчолачаў, агрэсіўных вадкасцей і газаў, трывала счапляюцца з інш. буд. матэрыяламі і канструкцыямі, хутка робяцца вязкія пры астыванні, пластычныя пры дадатных т-рах.

Паводле тэхн. уласцівасцей Б. падзяляюцца на маркі ў залежнасці ад расцягвання, вязкасці і т-ры размякчэння. Паводле прызначэння бываюць Б. дарожныя (для асфальтавых растворaў і бетонаў) і будаўнічыя (для дахавых і гідраізаляцыйных работ). Ідуць на выраб руберойду, пергаміну, гідраізолу, металаізолу, масцік, фарбавых эмульсій. Расплаўленыя Б. напампоўваюць у шчыліны і поры грунтоў, каб стварыць воданепранікальныя заслоны пры буд-ве гідратэхн. збудаванняў, праходцы шахтаў і падземных выпрацовак, буд-ве фундаментаў у раёне агрэсіўных грунтавых водаў. На Беларусі Б. выраблялі Полацкі нафтаперапр. завод.

БІФУРКАЦЫЯ РЭК (лац. bifurcatio раздваенне), разгалінаванне рэчышча або далiны рачной сістэмы на дзве пратокі, якія потым не зліваюцца і ўпадаюць у басейны розных рэк. Напр., басейн р. Арынока злучаецца пратокай Касік'ярэ з сістэмай р. Амазонкі. Пераліў вады з аднаго басейна ў другі ў час паводкі — сезонная Б. р.


БІХЕВІЯРЫЗМ (ад англ. behavior паводзіны), адзін з кірункаў у сучаснай бурж. псіхалогіі, які адмаўляе свядомасць як прадмет псіхалогіі. Узнік у пач. 20 ст. і найбольшае развіццё атрымаў у 20-я г. Пашыраны ў ЗША. Канцэпцыі Б. ўпершыню сфармуляваў амер. псіхолаг Дж. Уотсан (1913). Паводле Б., можна абысціся і без уліку свядомасці, дастаткова толькі вывучаць паводзіны (рэакцыі) і вонкавыя стымулы, якія выклікаюць гэтыя паводзіны. Выступае супраць фізіял. вывучэння мозгу, ігнаруе нервовыя і псіхічныя працэсы, якія ўзнікаюць у выніку вонкавага ўздзеяння і вызначаюць характар паводзін. Б. механічна тлумачыць рэфлекторную тэорыю І. П. Паўлава, прыніжае яе ролю ў тлумачэнні паводзін, не бачыць розніцы паміж паводзінамі чалавека і жывёлы, атаясамлівае мысленне і мову.

Узнікненне Б. абумоўлена сац.-паліт. і ідэйнатэарэт. прычынамі. Узмацненне ідэалаг. рэакцыі ў перыяд імперыялізму выклікала з'яўленне канцэпцый, якія прыніжаюць ролю свядомасці, імкнуцца разглядаць чалавека як «біялагічную машыну». На мяжы 20 ст. вылвілася негрунтоўнасць інтраспектыўнай тэорыі свядомасці, што вымушала шукаць новых шляхоў у псіхалогіі. Абмежаванасць Б. пачала выяўляцца ўжо ў 30-я г., калі ён пачаў распадацца на шэраг школ, якія папалі пад уплыў *гештальтпсіхалогіі* і *фрэйдызму*. Існуе некалькі кірункаў Б.: малярны Б. (амер. псіхолаг Э. Толмен), матэматычны (амер. псіхолаг К. Хал), сацыяльны (амер. псіхолаг Г. Мід) і інш.

Літ.: Павлов И. П. Ответ физиолога психологам, Полн. собр. соч., 2 изд., т. 3, кн. 2, М. — Л., 1951; Торндайк Э. Процесс учения у человека, пер. с англ., М., 1935. *В. М. Кавалёў.* Мінск.

БІЦЦІ, перыядычная змена амплітуды ваганняў пры складанні двух гарманічных ваганняў з вельмі блізкімі частотамі (гл. рыс.).

Вымяральнымі прыладамі Б. ўспрымаюцца не як два розныя ваганні, а як адно негарманічнае ваганне з амплітудай, якая перыядычна мяняецца. У акустыцы Б. чутны як перыядычная змена сілы гуку. Гетэрадзінны прыём у радыётэхніцы (гл. *Гетэрадзін*) наз. «прыёмам на Б.». Пасля дэтэкціравання Б. выклікаюць свіст, які перашкаджае радыёпрыёму. Б. намагаюць выявіць вельмі малую розніцу частаты ваганняў, што выкарыстоўваецца ў прыладах для вымярэння частаты, ёмістасці, індуктыўнасці, для настройкі муз. інструментаў.



Літ.: Стрелков С. П. Введение в теорию колебаний, 2 изд., М., 1964.

БІЦЫЛІН, лякарства з групы *антыбіётыкаў*. Крышталічная соль бензілпеніцыліну з дыбензілэтылендыямінам. Бела-жаўтаваты парашок; з вадой утварае суспензію. Выпускаецца ў чатырох лекавых формах пад нумарамі 1, 2, 3, 5. Уводзіцца ўнутрымышачна пры інфекцыйных хваробах, выкліканых адчувальнымі да пеніцыліну мікробамі (стрэптакокі, стафілакокі, пнеўмакокі), і пры сіфілісе. Ужываецца для прафілактыкі і лячэння рэўматызму.

БІЦЮГ, парода коней. Гадавалі ў Варонежскай і Тамбоўскай губ. па даліне р. Біцюг. Коні выносліявыя і вельмі цягавітыя. Выкарыстоўваліся пераважна ў транспарце вялікіх гарадоў Расіі, былі шырока вядомыя да канца 19 ст. Як пароду больш не гадуюць. У народзе біцюгамі называюць коней-цяжкавозаў.

БІЧ Іван Андрэевіч (псеўд. Таёжны; 1881, в. Ясьманаўцы Вілейскага пав. Віленскай губ. — кастр. 1919), герой грамадзянскай вайны. З сялян. Чл. Камуніст. партыі з 1917. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. Хаваючыся ад паліцыі, выехаў у Канскі пав. Енісейскай губ., дзе працаваў пісарам, настаўнікам. У 1911, каб весці прапаганду сярод рабочых, пераехаў у Тайшэт. Пасля Кастр. рэвалюцыі чл. Краснаярскага губрэўкома. У час наступлення Калчака пасланы ў Канскі павет для арганізацыі партыз. атрадаў. 17.2.1919 у с. Шытка стварыў партыз. атрад. Паўстанне ахапіла 13 валасцей, узнік т. зв. «Шыткінскі фронт». Больш за 1000 партызанаў, сярод якіх было шмат перасяленцаў з бел. губерняў, паспхова змагаліся з калчакаўцамі. Бесперапыннымі дыверсіямі на ўчастку Сібірскай чыгункі Тайшэт — Тулун яны стварылі т. зв. «тайшэцкую затычку», што зрывала забеспячэнне бела-



гвардзейцаў на Усх. фронце. Б. быў камісарам шыткінскіх партызанаў і ўзначальваў лятучы лыжны атрад. У час баявой аперацыі ў вер. 1919 Б. трапіў у палон і пасля катаванняў павешаны. Перад смерцю Б. заявіў ворагам: «Біча вы можаце павесіць, але рэвалюцыі павесіць вам не ўдасца!». У Тайшэце Б. пастаўлены помнік, яго імем названа сярэдняя школа.

Літ.: Криволуцкий П. Д. Шиткинские партизаны, М.— Иркутск, 1934; Дворянов Н. В. и Дворянов В. Н. В тылу Колчака, М., 1966.
Г. А. Каханоўскі. Маладзечна.

БІЧУРЫН Мікіта Якаўлевіч [у манастве Іакінф; 29.8(9.9).1777—11(23).5.1853], рускі гісторык, кітаязнавец. Сын беднага сельскага дзячка. У 1799 скончыў Казанскую духоўную акадэмію. У 1800 прыняў манаства. З 1828 чл.-кар. Пецярбургскай АН, з 1831 чл. Азіяцкага т-ва ў Парыжы. Апублікаваў многа навук. прац па пытаннях мовы, гісторыі, культуры, этнаграфіі і філасофіі Кітая, па гісторыі і культуры народаў Сярэд. Азіі, Манголіі. Б. высока цаніў В. Р. Бялінскі.

Літ.: Малькевич В. А. Материалы к библиографии трудов Н. Я. Бичурина, у кн.: Бичурин Н. Я. (Иакинф). Собрание сведений о народах, обитавших в Средней Азии в древние времена, т. 3, М.— Л., 1953, с. 87—101.

БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА Данута Іванаўна (н. 1.1.1938, в. Біскупцы Лідскага р-на Гродзенскай вобл.), беларуская савецкая паэтэса. З сялян. Скончыла гістор.-філал. ф-т Гродзенскага пед. ін-та (1962). Настаўнічае ў Гродне. Друкуецца з 1958. Першы зб. «Дзявочае сэрца» (1961). Асн. матывы паэзіі — апяванне Радзімы, жыцця працаўнікоў сучаснай вёскі, іх маральнай чысціні, прыгажосці прыроды і кахання. Лірыка Б.-З. нацыянальная па сваіх вытоках, фальклорнакаларытная па вобразнасці і мове, поліфанічная па гучанні, даверлівая па інтанацыях. Піша і для дзяцей. Паасобныя вершы Б.-З. перакл. на мовы народаў СССР.

Тв.: Нёман ідзе, Мн., 1964; Запаляйкі, Мн., 1967; Перапёлка, Мн., 1968; Грыб-парасон, Мн., 1969.

Літ.: Бураўкін Г. Як сасонка ў бары..., «Полымя», 1968, № 6; Рагойша В. Станаўленне голасу, «Маладосць», 1968, № 11.
А. А. Лойка. Мінск.

БІЧЭР-СТОЎ (Beecher-Stowe) Гарыет Элізабет (14.6.1811, Літфілд — 1.7.1896), амерыканская пісьменніца. З сям'і пастара. Першае апавяд. апубл. ў 1834. Сусв. вядомы раман «Хаціна дзядзькі Тома» (1851—52, асобн. выд. 1852). Нягледзячы на хрысціянскае маралізаванне, твор меў вялікі ўплыў на амер. абаліцыянісцкі рух. Рэаліст. адлюстраванне жыцця неграў-рабоў зрабіла раман сапраўды нар. кнігай. Праблеме рабства ў ЗША прысвечаны публіцыст. кн. «Ключ да хаціны дзядзькі Тома» (1853) і раман «Дрэд, аповесць пра праклятае балота» (1856).

Тв.: Рус. пер.— Хижина дяди Тома, М., 1961.

БІЯ... (грэч. bios жыццё), у складаных словах паказвае на адносіны дадзеных слоў да жыцця, жыццёвых працэсаў, біялогіі (напр., *біяграфія, біяхімія*).

БІЯГЕАГРАФІЯ (*бія...* + грэч. gē зямля + + gráphō пішу), навука пра пашырэнне і размеркаванне жывых арганізмаў, іх згрупаванняў (*біяцэнозаў*) па зямным шары, пра характар фаўны і флоры пэўных геаграфічных адзінак. Складаецца з геаграфіі біяцэнозаў, *зоагеаграфіі* і батанічнай геаграфіі (*геаграфіі раслін*).

БІЯГЕАХІМІЯ (*бія...* + грэч. gē зямля + + *хімія*), галіна *геахіміі*, навука пра геахімічныя працэсы, што адбываюцца ў *біясферы* з удзелам жывых арганізмаў. Вывучае хім. састаў жывога рэчыва, ролю арганізмаў у працэсе міграцыі, размеркавання, рассеяння і канцэнтрацыі хім. элементаў у зямной кары. Заснавальнік Б. сав. вучоны У. І. *Вярнадскі*, які арганізаваў у Кіеве (1918) першую біягеахімічную лабараторыю.

У зямной кары каля 0,01% ($n \cdot 10^{14}$ *кг*) жывога рэчыва. Найб. канцэнтрацыя яго на асобных участках паверхні (фітапланктон у морах і акіянах, раслінная покрыва). Гал. масу жывога рэчыва складаюць: O 70%; C 18; H 8; P 0,7; Ca 0,5; N 0,5; K 0,2; S 0,2%, астатніх элементаў мала. Але ёсць арганізмы, што пераважна канцэнтруюць асобныя элементы. Вядомы арганізмы — канцэнтратары Li, B, F, Al, Si, P, Mg, S, Cl, K, Ca, V, Mn, Fe, Co, Cu, Zn, As, Sr, Br, I, Ba, Th, U. Яны служаць паказчыкамі геахімічнага асяроддзя. Жывое рэчыва робіць вялікі ўплыў на састаў атмасферы. Праз *фотасінтэз* расліны актыўна ўздзейнічаюць на кругазварот рэчываў у прыродзе. Вынікам жыццядзейнасці арганізмаў з'яўляецца вялікая група *асадкавых горных парод* біягеннага паходжання — біяліты (даламіты, вапнякі, дыятаміты, фасфарыты і інш.), у т. л. гаручыя біяліты — каўстабіяліты (торф, вугалі і інш.). Вядомы радовішчы марганцу, жалеза, серы і інш. біял. паходжання (гл. *Асадкавыя радовішчы*). Асобныя вобласці зямной паверхні адрозніваюцца ўзроўнем змяшчэння хім. элементаў і таму выклікаюць розную біял. рэакцыю мясцовай флоры і фаўны. Такія вобласці паз. біягеахімічнымі правінцыямі (БП). Вучэнне пра БП — адзін з раздзелаў Б., распрацаваны сав. вучоным А. П. Вінаградавым. Ад недахопу або лішку некат. элементаў у глебах узнікаюць хваробы (біягеахімічныя эндэміі) раслін і жывёл (вапляк ад недахопу ёду, хвароба «апрацоўкі» ў злакавых культур ад недахопу медзі). Тэр. Беларусі характэрны недахоп ёду, фтору, кальцыю, кобальту, месцамі медзі, бору, малібдэну. Паводле К. І. *Лукашова*, тут вылучаюцца тры БП: паўночная (Беларускае Паазер'е) — з найб. змяшчэннем шэрагу элементаў у прыродным асяроддзі, паўднёвая (Беларускае Палессе) — з найменшым і цэнтральная — з прамежкавымі характарыстыкамі.

Распрацоўкай праблем Б. займаецца Ін-т геахіміі і аналіт. хіміі імя Вярнадскага АН СССР. Перыяд. выданне па праблемах Б. — «Труды биогеохимической лаборатории АН СССР» (з 1930). Біягеахімічныя даследаванні покрыўных адкладаў БССР вядуцца ў Лабараторыі геахім. праблем АН БССР. Узначальвае іх акад. АН БССР К. І. Лукашоў. Практычнае выкарыстанне Б.: біягеахім. метад пошукаў карысных выкапняў. Сутнасць яго ў выяўленні *арэолаў рассеяння* руды па глебах і раслінах. Паказчыкам служыць павелічэнне колькасці асобных рудных элементаў і змена іх суадносін у глебе і ў попеле раслін над радовішчам. Найб. высокая адчувальнасць метаду ў параўнанні з інш. геахім. метадамі ў тым, што расліны з водных растворaў утвараюць выцяжку элементаў і іх канцэнтрацыю з вялізнага аб'ёму глебы або парод. На Беларусі гэты метад неэфектыўны, бо перашкаджае магутнае (больш за

50 *м*) асадкавае покрыва чацвярцічных парод, у якім водатрывалыя гліністыя пароды перашкаджаюць кантакту карэння раслін з глыбіннымі водамі. Вылучэнне біягеахім. правінцый мае практычнае значэнне ў расліна-водстве (гл. *Аграхімія*), жывёлагадоўлі.

Літ.: Вернадский В. И. Биосфера, М., 1967; Виноградов А. П. Биогеохимические провинции, М.—Л., 1949; Малюга Д. П. Биогеохимический метод поисков рудных месторождений, М., 1963; Геохимические провинции покровных отложений БССР, под ред. К. И. Лукашева, Мн., 1969.

В. Р. Бенсман. Мінск.

БІЯГЕАЦЭНОЗ (*бія...* + грэч. gē зямля + + koinós агульны), комплекс раслін, жывёл і мікраарганізмаў на пэўным участку зямной паверхні ў спалучэнні з асаблівасцямі клімату, глебы, воднага рэжыму. Заснавальнік павукі пра Б. акад. У. М. *Сукачоў* распрацаваў ідэі айчынных вучоных (В. В. Дакучаева, Г. Ф. Марозава, Л. С. Берга, І. У. Мічурына, Г. М. Высоцкага і інш.) пра ўзаемасувязь жывых арганізмаў з навакольным асяроддзем і ў 1940 прапанаваў тэрмін Б. Кожнаму Б. характэрны бесперапынныя змены і развіццё ў сувязі са зменамі іх кампанентаў і знешніх фактараў (геалагічных, кліматычных, касмічных). Дзейнасць чалавека таксама ўплывае на Б. і стварае новыя — культурбіягеацэнозы. Аднародныя паводле саставу, кірунку і інтэнсіўнасці абмену рэчываў і энергіі Б. аб'ядноўваюць у тыпы біягеацэнозаў; навука, якая іх вывучае, наз. біягеацэналогіяй.

Літ.: Основы лесной биогеоценологии, под ред. В. Н. Сукачева и Н. В. Дылиса, М., 1964.

І. Д. Юркевіч. Мінск.

БІЯГЕЛЬМІНТЫ [*бія...* + грэч. helmins (helminthos) чарвяк], паразітычныя чэрві, цыкл развіцця якіх праходзіць са зменай гаспадароў (лічынка развіваецца ў адным арганізме — прамежкавым гаспадары, а дарослая асобіна паразітуе і размнажаецца полавым шляхам у другім — канчатковым гаспадары). У цыкле развіцця некат. відаў Б. удзельнічаюць два і болей прамежкавых гаспадароў, якімі бываюць беспазваночныя (малюскі, ракападобныя, насякомыя і інш.) і пазваночныя жывёлы (млекакормячыя, земнаводныя, рыбы і інш.). Да Б. належаць стужкавыя чэрві (цэстоды), смактуны (трэматоды), скрэбні (акантацэфалы), некаторыя круглыя чэрві (нематоды).

БІЯГЕНЕТЫЧНЫ ЗАКОН, паўтарэнне ў індывідуальным развіцці (антагенезе) арганізма галоўных этапаў гістарычнага развіцця (філагенезу) усяго раду продкаў. Асабліва ярка Б. з. выяўляецца на зародкавай стадыі развіцця млекакормячых, напр. у наяўнасці жаберных адтулін, якія аднавядаюць іх рыбападобным продкам. Заканамернасць сувязі анта- і філагенезу ўласціва таксама раслінным арганізмам.

Аўтарамі Б. з. лічаць Ф. Мюлера (1864) і Э. Гекеля (1866), але яшчэ ў 1859 сувязь паміж індывідуальным і гістар. развіццём арганізмаў паказаў Ч. Дарвін. Мюлер расшырыў думку Дарвіна і лічыў, што ў развіцці патомства адхіленне ад развіцця продкаў можа быць на сярэдніх або канцавых стадыях эмбрыягенезу. Гекель сфармуляваў Б. з.: «Антагенез а'яўляецца кароткім і хуткім паўтарэннем філагенезу...» Вучоны лічыў, што антагенез — гэта «ўкарочаны» рад прыкмет (палінгенезаў), паўтарэнне стану продкаў, а новыя змены (цэнагенезы) у працэсе філагенетычнага развіцця навіраюцца ў постэмбрыянальным перыядзе як надстаўкі да палінгенезаў. Рус. вучоныя А. А. Кавалеўскі і І. І. Мечнікаў у адпаведнасці з вучэннем Дарвіна першыя вызначылі сваяцкую сувязь розных тыпаў жывёл і адзінства законаў іх развіцця. А. М. Северцаў дапоўніў (1910) Б. з. тэорыяй філэмбрыягенезаў, паводле якой у працэсе антагенетычнага развіцця на розных эмбрыянальных і постэмбрыянальных стадыях узнікаюць новыя змены і уплываюць на ход філагенезу. І. У. Мічурын даказаў, што пад уплывам змен умоў існавання новыя ўласцівасці ўзнікаюць на ўсіх стадыях антагенезу; патрэбы, якія ўзнікалі ў філагенезе, адлюстроўваюцца на розных стадыях антагенезу раслін.

Літ.: Мюллер Ф. и Геккель Э. Основной биогенетический закон, М.—Л., 1940; Северцов А. Н. Главные направления эволюционного процесса, 3 изд., М., 1967; Современные проблемы эволюционной теории, Л., 1967; Тимофеев-Ресовский Н. В., Воронцов Н. Н. и Яблоков А. В. Краткий очерк теории эволюции, М., 1969; Лябёдкін С. Біягенетычны закон і тэорыя рэкапітуляцый, Мн., 1936.

В. С. Анохіна. Мінск.

БІЯГРАФІЧНЫ ФІЛЬМ, кінатвор пра жыццё і дзейнасць гістарычнай асобы. У СССР пашырыўся з развіццём гукавога кіно. Вызначаецца імкненнем да гістар. дакладнасці, паказам сутнасці дзейнасці героя, сацыяльных умоў; звычайна ахоплівае вялікі перыяд жыцця героя. Сярод Б. ф.— кінастужкі пра У. І. Леніна, герояў рэвалюцыі, палкаводцаў, вучоных, пісьменнікаў, кампазітараў.

У канцы 40 — пач. 50-х г. пераважаў у сав. кіно. Фільмы: «Пётр I» (1 і 2-я серыі, 1937—39), «Валерый Чкалаў» (1941), «Пірагоў» (1947), «Мічурын» (1948), «Мусаргскі» (1950), «Тарас Шаўчэнка» (1952) і інш. Створана многа дакументальных Б. ф. У бел. кіно рысы Б. ф. маюць: «Кастусь Каліноўскі» (1928), «Канстанцін Заслонаў» (1949). Бел. дакумент. кіно налічвае шмат біяграфічных нарысаў: «Георгій (Францыск) Скарына», «Дачка партыі» («В. З. Харужая», 1962), «Кастусь Каліноўскі» (1963), «Барацьба і творчасць» («П. М. Лепяшынскі», 1967), «Партытура жыцця» («Я. К. Цікоцкі», 1968), «У агні жыцця» («К. Арлоўскі», 1969); кінапартрэты пар. паэтаў і пісьменнікаў Беларусі Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, П. Броўкі, М. Лынькова, артыстаў Б. Платонава, Г. Глебава, А. Ільінскага, П. Малчанава.

Літ.: Юренев Р. Н. Биографические фильмы, у кн.: Очерки истории советского кино, т. 3, М., 1961.

Е. Л. Бондарава. Мінск.

БІЯГРАФІЯ (*бія...* + грэч. gráphō пішу), жыццёпіс якога-н. чалавека. Б. бываюць навуковыя, мастацкія, акадэмічныя, папулярныя і інш. На фактычным матэрыяле Б. разглядаецца развіццё асобы ў сувязі з грамадскімі адносінамі пэўнай гістар. эпохі. Вывучэнне Б. выдатных гістар. дзеячаў (К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна), вучоных, пісьменнікаў, мастакоў мае вялікае навук., пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Разнавіднасць Б.— *аўтабіяграфія.*

БІЯЛАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ, падрыхтоўка навуковых работнікаў для навукова-даследчых устаноў біял., с.-г., мед. профілю і выкладчыкаў адпаведных дысцыплін для сярэдніх школ.

У Расіі развіваецца з сярэдзіны 18 ст. (у 1755 засн. Маскоўскі ун-т, на мед. ф-це якога выкладаліся і біял. навукі). У пач. 19 ст. ў Дэрпце (Тарту), Казані, Харкаве адкрыты ун-ты з мед. ф-тамі. Біял. дысцыпліны выкладаліся таксама на фіз.-матэм. аддзяленнях ун-таў, у с.-г. ВНУ. У пач. 20 ст. Б. а. ў заруб. краінах і ў Расіі паступова вылучаецца ў самастойную галіну адукацыі, не звязаную з медыцынай ці з агранамічнай.

Шырока развіваецца Б. а. ў нашай краіне пачала пасля Кастр. рэвалюцыі. У 1923—27 у многіх ун-тах арганізаваны біял. аддзяленні ці ф-ты. Значна павялічылася колькасць пед. ін-таў, якія маюць біял. аддзяленні. У СССР штогод выпускаецца больш як 100 тыс. спецыялістаў з вышэйшай агульнабіял. (універсітэцкай і пед.) і спец. біял. (мед. і с.-г.) адукацыяй. У апошнія гады ў сувязі з новымі метадамі даследаванняў у біялогіі (электронная мікраскапія, метад мечаных атамаў, рэнтгеналструктурны аналіз і інш.) ВНУ рыхтуюць біёлагаў з павялічаным аб'ёмам фіз., матэм. і хім. ведаў. На біял., фіз.-матэм. і хім. ф-тах ун-таў ствараюцца аддзяленні і кафедры біяфізікі і біяхіміі. ВНУ вядуць н.-д. работу ў галіне біялогіі, рыхтуюць кадры праз аспірантуру.

У БССР упершыню кафедры батанікі, заалогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі свойскіх жывёл і чалавека і інш. створаны ў 1919 у Горы-Горацкім ін-це. У 1921 на пед. ф-це БДУ арганізаваны кафедры батанікі, заалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл. У 1927 у БДУ адкрыты біял. ф-т, у розныя гады дадаткова створаны кафедры фізіялогіі раслін, генетыкі і цыталогіі, мікрабіялогіі і вірусалогіі, біяхіміі і біяфізікі. Кафедра заалогіі падзялілася на кафедру беспазваночных і кафедру пазваночных жывёл. Штогод біял. ф-т БДУ выпускае каля 250 спецыялістаў. Выкладчыкаў біялогіі для сярэдніх школ рэспублікі рыхтуюць ф-ты прыродазнаўчага профілю Гомельскага ун-та, Мінскага, Гродзенскага, Віцебскага і Брэсцкага пед. ін-таў.

Сістэма Б. а. ў інш. сацыяліст. краінах падобная да сістэмы Б. а. ў СССР: ажыццяўляецца пераважна ва ун-тах з 5-гадовым навучаннем. Ва ўсіх краінах расце падрыхтоўка кадраў біёлагаў, асабліва спецыялістаў у галіне біяхіміі, генетыкі, вірусалогіі, радыебіялогіі, малекулярнай біялогіі, біяфізікі і інш. Гл. таксама *Аграномічная адукацыя, Ветэрынарная адукацыя, Медыцынская адукацыя, Сельскагаспадарчая адукацыя.*

П. Р. Пятровіч. Мінск.

БІЯЛАГІЧНАЯ АХОВА, 1) экран, які засцерагае жывыя арганізмы ад радыеактыўнага выпрамянення. Ставіцца паміж крыніцай выпрамянення (напр., *актыўная зона* атамнага рэактара) і месцам, дзе знаходзяцца людзі. Выбар матэрыялу і таўшчыні экрана залежыць ад віду і інтэнсіўнасці выпрамянення. Для аховы ад патоку нейтронаў першы слой экрана робяць з вадародзмяшчальных матэрыялаў (вада, поліэтылен), якія запавольваюць нейтроны. Другі слой робяць з рэчываў, здольных паглынаць гама-выпрамяненне, што ўтвараецца ў выніку запавольвання нейтронаў (свінец, карбід бору). Б. а. сховішчаў грамадз. абароны ад выпрамянення атамнага выбуху можа быць слой пяску, зямлі, бетону. Напр., слой зямлі таўшчынёй 0,56 *м* памяншае пранікальную радыяцыю ў 16 разоў. 2) Медыцынская прафілактыка арганізмаў ад іанізацыі выпрамянення. Біялагічнае ахоўнае дзеянне маюць медыкаменты, у якіх ёсць сульфагідрыльная група (цыстэін, глютацыён), акцэптары кіслароду (цыяніды), вітаміны (піродаксін, рыбафлавін).

БІЯЛАГІЧНАЯ ЗБРОЯ, сродак масавага заражэння людзей, с.-г. жывёлы і раслін распаўсюджваннем узбуджальнікаў хвароб (бактэрый, вірусаў, рыкецсій, грыбкоў), ядаў (таксінаў), якія выпрацоўваюць некаторыя бактэрыі, і наўмысна заражанымі насякомымі, кляшчамі, грызунамі. Як Б. з. могуць ужывацца ўзбуджальнікі чумы, тулярэміі, бруцэлёзу, сібірскай язвы, сапу, халеры, сыпнога тыфу, натуральнай воспы, яшчуру, іржы збожжавых культур і інш., а таксама батулінічны і інш. таксіны. Хваробныя мікробы і таксіны звычайна ўжываюцца ў сумесі з рознымі вадкімі і сухімі рэчывамі. Такімі сумесямі напаўняюцца авіяц. бомбы і кантэйнеры, баявыя часткі ракет, артыл. снарады і міны. Заражэнне памяшканняў, вады, харч. прадуктаў, фуражу і інш. можа рабіцца і шляхам дыверсій. Бяспека насельніцтва дасягаецца арганізацыяй калектыўнай і індывідуальнай засцярогі ад Б. з. Гл. *Засцярога ад зброі масавага паражэння.*

Б. з. ўжывалася ў час 1-й сусв. вайны. Нямецкае камандаванне засылала ў тыл праціўніка дыверсантаў, якія заражалі вадаёмы ўзбуджальнікамі чумы, сапу, халеры. Дакументы Нюрнбергскага працэсу над ваен. злачынцамі (1945—46) сведчаць, што фаш. Германія рыхтавала бактэрыялагічную вайну. Ужывалі Б. з. японскія захопнікі ў 1939 у раёне р. Халхін-Гол (МНР) і ў 1940—42 каля Ніпбо (Кітай), амер. інтэрвенты ў час агрэсіі ў Карэі. У адпаведнасці з міжнар. правам (гл. *Жэнеўскія пратаколы*) выраб і выкарыстанне Б. з. а'яўляюцца найцяжэйшым злачынствам супраць чалавецтва. Аднак у Злучаных Штатах Амерыкі і некаторых інш. капіталіст. краінах вырабляюцца і выпрабоўваюцца бактэрыяльныя сродкі вайны. СССР выступае за забарону Б. з. XXIV сесія Генеральнай Асамблеі ААН (1969) зацвердзіла рэзалюцыю «Аб забароне хімічнай і бактэрыялагічнай (біялагічнай) зброі», прынятую на падставе сумеснай прапановы сацыяліст. краін — чл. ААН: БССР, Балгарыі, Венгрыі, Манголіі, Польшчы, Румыніі, СССР, УССР, Чэхаславакіі. (Бактэрыялагічная зброя — частка паняцця біялагічная зброя).

Літ.: Бактериологическое оружие и защита от него, М., 1967.

У. Н. Волкаў. Мінск.

БІЯЛАГІЧНЫЯ ЧАСОПІСЫ, перыядычныя выданні, у якіх публікуюцца матэрыялы па праблемах біялагічных навук.

Першы спец. Б. ч. у Расіі — «Бюллетень Московского общества испытателей природы» (з 1829). Навук.-папулярныя матэрыялы па біялогіі друкаваліся ў «Вестнике естественных наук» (1854—60). З 2-й пал. 19 ст. выходзілі перыяд. выданні навук. т-ваў: «Труды русского энтомологического общества» (1861—1932), «Известия общества любителей естествознания, антропологии и этнографии, состоящего при имп. Московском университете» (1865—1916), «Труды общества испытателей природы при Харьковском университете» (1869—1918, на ўкр. мове ў 1925—30), «Труды Петроградского общества естествоиспытателей» (1870—1914, 1916, з 1917 паз. «Труды Ленинградского общества естествоиспытателей»); выданні навук. устаноў «Труды Ботанического сада» (1871—1931, з 1931 «Труды Ботанического института имени В. Комарова Академии наук СССР»), «Ботанические записки» (Батанічны сад Пецярбургскага ун-та 1886—1916), «Ежегодник зоологического музея Академии наук» (1896—1931) і інш. У пач. 20 ст. выходзілі «Русский антропологический журнал» (1900—30), «Русский ботанический журнал» (1908—15).

Пасля Кастр. рэвалюцыі з'явіліся новыя Б. ч. Выданні АН СССР: «Журнал общей

біологии» (з 1940), «Успехи современной биологии» (з 1932), «Микробиология» (з 1932), «Биохимия» (з 1936), «Палеонтологический журнал» (з 1959), «Вопросы микропалеонтологии» (з 1956), «Физиологический журнал СССР им. И. М. Сеченова» (з 1917), «Журнал высшей нервной деятельности им. И. П. Павлова» (з 1951), «Цитология» (з 1959) і інш. Выходзяць рэфератыўныя час. «Биология» (13 выпускаў па розных галінах біялогіі), «Биофизика» (з 1956). Матэрыялы па біялогіі друкуюцца ў навук.-папулярных час. «Наука и жизнь» (з 1934), «Природа» (з 1912), «Знание — сила» (з 1926) і інш. У саюзных рэспубліках выдаюцца: «Айастані кенса банакан андес» («Біял. часопіс Арменіі»), «Український біохімічний журнал» (з 1926). Ін-т біял. навук АН БССР выдаваў штогоднік «Матэрыялы да вывучэння флоры і фаўны Беларусі» (1927—32). З 1956 выходзіць серыя «Біялагічныя навукі» ў «Весцях Акадэміі навук БССР», з 1957 штогоднік «Бюлетэнь Института биологии АН БССР» (з 1963 пад назвай «Ботаника»). З 1969 — «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна» (2-я серыя: біялогія, хімія, геалогія, геаграфія).

Найбольш вядомыя зарубежныя В. ч.: Венгрыя — «Acta biologica» («Працы па біялогіі», з 1950); Вялікабрытанія — «Annals of Applied Biology» («Прыкладная біялогія», з 1914), «Journal of Experimental Biology» («Эксперым. біялогія», з 1923); ГДР — «Biologische Rundschau» («Біял. агляд», з 1963); (Biologishes Zentralblatt» («Веснік біялогіі», з 1881); «Berichte über die Gesamte Biologie» («Агульная біялогія», з 1926); ЗША — «Biological Abstracts» (Рэфератыўны час. па біялогіі, з 1926); «Physiological Reviews» («Фізіялогія», з 1921); Італія — «Archives Itallennes de Biologie» («Італьянскі біял. архіў», з 1882); «Archivio di Scienze Biologiche» («Архіў біял. навук», з 1919—20); Польшча — «Acta Biologiae Experimentalis» («Працы па эксперым. біялогіі», з 1928); «Folia Biologica» («Пытанні біялогіі», з 1953); Францыя — «Année Biologique» («Біял. штогоднік», з 1895); ФРГ — «Zeitschrift für Naturforschung Ausgabe B». («Прыродазнаўства, ч. Б», з 1946); «Naturwissenschaften» («Прыродазнаўчыя навукі», з 1913); Чэхаславакія — «Biologia» («Біялогія», з 1964).

А. Дз. Васілеўская, Л. І. Збралевіч. Мінск.

БІЯЛОГІЯ (грэч. *бія...+...логія*), комплекс навук пра жыццё як асобную форму руху матэрыі, што гістарычна ўзнікла з нежывой прыроды. Задача Б. — раскрыць заканамернасці жыцця ва ўсіх яго праявах, паznаць сутнасць, паходжанне і развіццё жывых істот, іх адносін паміж сабою і з нежывым асяроддзем. Мэта Б. — кіраваць усімі праявамі жыцця на карысць грамадству. Б. служыць асновай раслінаводства, жывёлагадоўлі, медыцыны, ветэрынарыі, рыбнай і лясной гаспадаркі, мікрабіялагічнай прамысловасці і інш. галін практычнай дзейнасці чалавека. Асабліва вялікае значэнне мае ў стварэнні паслядоўнага матэрыялісг. светапогляду, у паznанні чалавека і яго месца ў прыродзе. Б. і асабліва *эвалюцыйнае вучэнне* даюць прыродна-гістар. аснову матэрыялісг. погляду на развіццё грамадства. Метадалагічнай асновай сучаснай Б. з'яўляецца *дыялектычны матэрыялізм*. Тэрмін Б. прапанавалі ў 1802, незалежна адзін ад аднаго, француз Ж. Б. *Ламарк* і немец Г. Р. Трэвіранус. Ужываецца таксама ў вузкім сэнсе як спосаб жыцця віду. Самыя вялікія раздзелы Б. *заалогія* і *батаніка*. Яны адасобіліся раней за іншыя. Пазней вылучылася *мікрабіялогія*. Б. падзяляецца на мноства навук пра асобныя сістэматычныя групы жывых істот (таксанамічныя дысцыпліны) або асобныя ўласцівасці, характэрныя ўсім арганізмам (асноўныя дысцыпліны). Да першай групы належаць навукі: пра водарасці — *альгалогія*, пра грыбы — *мікалогія*, пра дрэвы і кусты — *дэндралогія*, пра прасцейшых — *пратысталогія*, пра насякомых — *энтамалогія*, пра рыб — *іхтыялогія*, пра птушак — *арніталогія*, пра звяроў — *тэрыялогія* і інш. Чым больш важнае нар.-гасп. значэнне мае сістэматычная група арганізмаў, тым больш дробныя аб'яднанні відаў вылучаюцца ў самастойныя навук. дысцыпліны. Да асн. навук належаць марфалогія (гл. *Марфалогія жывёл* і *Марфалогія раслін*), *анатомія* (гл. таксама *Анатомія раслін*), *эмбрыялогія*, *гісталогія*, *цыталогія*, *фізіялогія*, *экалогія*, *генетыка*, біялогія развіцця, эвалюцыйнае вучэнне. У сувязі са спецыфічнасцю асяроддзяў жыцця вылучыліся *гідрабіялогія*, *паразіталогія*. Кожная асн. дысцыпліна Б. падзяляецца на галіны ў адпаведнасці з таксанамічнымі згрупаваннямі, напр. марфалогія бактэрый, фізіялогія водарасцей, генетыка птушак. Параўнальнае вывучэнне ўласцівасцей сістэматычных груп арганізмаў выклікала неабходнасць стварыць параўнальныя асн. навукі: параўнальную марфалогію, параўнальную фізіялогію і інш. На стыках біялогіі і інш. навук узніклі і развіваюцца *біяхімія*, *біяфізіка*, *радыебіялогія*, *біягеаграфія*, *біёніка*, *біягеахімія* і інш.

Веды пра жывыя істоты людзі збіралі яшчэ ў глыбокай старажытнасці, але доўгі час яны былі разрозненыя. Першы спрабаваў сістэматызаваць звесткі пра жыццё жывёл старажытнагрэч. філосаф *Арыстоцель* (4 ст. да н. э.). Ён апісаў некалькі сотняў відомых тады жывёл, што дало пачатак заалогіі. У 4—3 ст. да н. э. з'явіліся працы Тэафраста пра расліны, якія сталі пачаткам батанікі. Урачы старажытнасці *Гіпакрат* (5—4 ст. да н. э.) і К. *Гален* (2 ст. да н. э.) далі першыя навук. звесткі пра ўнутраную будову жывёл і чалавека. Геніяльныя здагадкі пра паходжанне жыцця і паступовую зменлівасць арганізмаў выказаў рымскі філосаф Лукрэцый Кар (1 ст. да н. э.). У эпоху Адраджэння (пачынаючы з 2-й пал. 15 ст.) пачалося вывучэнне ўсёй разнастайнасці жывёл і раслін, будовы і жыццядзейнасці жывых істот, у т. л. і чалавека. У 16 ст. з'явіліся працы вялікіх анатамаў таго часу *Леанарда да Вінчы*, А. *Везалія*, М. Сервета, Б. Еўстахіо, якія дасканала вывучалі ўнутраную будову чалавека і жывёл. У 1-й пал. 17 ст. з'явілася вучэнне англ. прыродазнаўца У. *Гарвея* пра кровазварот. Выпадковае адкрыццё мікраскопа і выкарыстанне яго ў Б. адкрылі свету найдрабнейшых істот. Намнажэнне фактычнага матэрыялу пра разнастайных жывёл і расліны вымагала распрацоўкі сістэмы, навук. класіфікацыі расліннага і жывёльнага свету. У сярэдзіне 18 ст. ле стварыў швед. прыродазнавец К. *Ліней*, які прапанаваў сістэматычныя катэгорыі: клас, парадак або атрад, род, від і разнавіднасць і ўвёў бінарную наменклатуру відаў. Важнымі вехамі ў развіцці Б. 18 ст. былі вучэнні пра эпігенез (рус. акад. К. Ф. Вольф), раздражняльнасць (італьян. вучоны Л. *Гальвані* і інш.), фізіялогію дыхання (англ. вучоны Дж. Прыстлі, француз А. Л. Лавуазье), адкрыццё фотасінтэзу ў раслін і ролі ў ім вялёнага ліста і святла (галандзец Ян Інгенгаўс, швейцарцы Ж. Сенеб'е, Н. Т. Сасюр). У канцы 18 ст. даказана наяўнасць полу ў раслін (ням. батанік І. Г. Кёльрэйтэр) і немагчымасць самазараджэння жывёл і раслін (італьян. вучоныя Ф. Рэдзі, Л. Спаланцані, галандзец Ян Свамердам, рус. прыродазнавец М. М. Церахоўскі). У пач. 19 ст. пашыраюцца ідэі гістар. развіцця арган. свету і адзінства ўсяго жывога (Ламарк). Вызначаецца прынцып паралелізму *актагенезу* і *філагенезу*, які стаў асновай *біягенетычнага закону*. Фарміруецца вучэнне пра зародкавыя лісткі (рус. акадэмікі Х. І. Пандэр і К. М. *Бэр*) і распрацоўваюцца асновы параўнальнай эмбрыялогіі (Бэр). Вялікі фактычны матэрыял па мікраструктурах жывёл і раслін прывёў да адзінаго з найб. значных абагульненняў сучаснай Б. — клетачнай тэорыі, якую ў канчатковым выглядзе сфармуляваў немец Т. Шван у 1839. У сярэдзіне 19 ст. адкрыты асаблівасці жыўлення раслін, вывучаны прынцыпы кругавароту рэчываў у прыродзе (немец Ю. Лібіх), высветлена роля сакрэтаў залоз у страваванні жывёл і абгрунтавана паняцце пра ўнутранае асяроддзе, якое вызначае агульную рэгуляцыю жыццядзейнасці арганізма (француз К. *Бернар*). У гэты час распрацаваны метады даследавання фізіялогіі нервова-мышачнай сістэмы і органаў пачуццяў (немец Г. *Гельмгольц*). Вялікае дасягненне Б. ў 2-й пал. 19 ст. — адкрыццё ролі мікраарганізмаў у працэсах браджэння і ў этыялогіі інфекцыйных хвароб чалавека і жывёл (франц. вучоны Л. *Пастэр*, ням. мікрабіёлаг Р. *Кох*). Былі адкрыты і вылучаны з харч. прадуктаў вітаміны і паказана іх роля ў жыцці арганізмаў (сав. біяхімік М. І. Лунін, польскі вучоны К. *Функ*). У канцы 19 ст. развіваецца хімія бялкоў і нуклеінавых к-т, адкрыта новая форма жыцця — вірусы (рус. вірусолаг Дз. І. *Іваноўскі*). Найвялікшае абагульненне Б. 19 ст. — эвалюцыйная тэорыя англ. вучонага Ч. *Дарвіна* (1859) пра паходжанне відаў праз натуральны адбор. Папярэднікам Дарвіна ў Расіі быў К. Ф. *Рулье*, які стварыў вучэнне пра гістар. зменлівасць жывых істот пад уплывам фактараў знешняга асяроддзя. Рускі вучоны Бэр сфармуляваў навук. падставы сучаснай эмбрыялогіі — вучэнне пра зародкавыя лісткі. А. А. *Кавалеўскі* (рус. вучоны) даказаў эвалюц. сувязь паміж названочнымі і беспазваночнымі жывёламі, заснаваў параўнальную і эвалюцыйную эмбрыялогію, яго брат У. А. *Кавалеўскі* — эвалюц. палеанталогію. Матэрыялісг. асновы вывучэння псіхічнай дзейнасці чалавека закладзены працы рус. фізіёлагаў І. М. *Сечанава*, які адкрыў цэнтральнае тармажэнне, вывучыў рэфлексы галаўнога мозгу (закладзены асновы матэрыялісг. разумення вышэйшай нервовай дзейнасці), і І. П. *Паўлава*, які стварыў вучэнне пра ўмоўныя рэфлексы і тыпы нервовай дзейнасці. Важная вяха ў развіцці Б. 19 ст. — адкрыццё *фагацытозу* і распрацоўка тэорыі паходжання шматклетачных арганізмаў ад аднаклетачных (рус. вучоны І. І. *Мечнікаў*). Вялікае значэнне мелі расшыфроўка кругавароту азоту (рус. мікрабіёлаг С. М. *Вінаградскі*) і дастасаванне закону захавання рэчыва і энергіі да жывых істот на прыкладзе жыццядзейнасці яўлёных раслін (рус. вучоны К. А. *Ціміразеў*), а таксама вучэнне пра глебу як асобнае прыроднае цела, звязанае з жыццядзейнасцю арганізмаў (рус. вучоны В. В. *Дакучаеў*). Істотнае ў развіцці Б. 19 ст. — адкрыццё чэхам Г. І. *Мендэлем* (1866) законаў спадчыннасці, якія сталі асновай генетыкі. У 20 ст. развіваюцца новыя дысцыпліны Б.: цыталогія, генетыка, эвалюц. вучэнне, экалогія. У 20-я г. 20 ст. даказана магчымасць эксперыментальна атрымліваць мутацыі з дапамогай рэнтгенаўскіх прамянёў (сав. вучоны Г. А. Надсан, амер. генетык Г. Мёлер), хім. рэчывам (сав. генетык І. А. Рапапорт), што дазволіла эксперымент. паскараць спадчынную зменлівасць арганізмаў. У 30—40-я г. адкрыты і вылучаны антыбіётыкі (англ. мікрабіёлаг А. *Флемінг*, амер. мікрабіёлаг С. Я. Ваксман і інш.). Вялікае абагульненне Б. 20 ст. — вучэнне пра біясферу (сав. вучоны У. І. *Вярнадскі*). На аснове гэтага вучэння падлічана маса жывога рэчыва ў лясах, вадаёмах і абагульнены звесткі пра кругаварот хім. элементаў. Створана новая галіна агульнай Б. — біягеацэналогія, якая вывучае біял. комплексы розпай складанасці, іх узаемадзеянне паміж сабой і з глебава-кліматычнымі ўмовамі (сав. вучоны У. М. *Сукачоў*). Паказана роля мікраарганізмаў у пераўтварэнні зямной паверхні (рус. вучоныя В. Л. *Амяляпскі*, Я. М. *Мішусціп* і інш.) і роля жывёл у гэтых працэсах (сав. заолаг М. С. Гіляроў). У 20—40-я г. створаны тэорыя малекулярнай будовы храмасом (рус. генетык М. К. *Кальцоў*), складанай структуры гена (сав. генетыкі А. С. Серабро́ўскі, М. П. *Дубінін*), *папуляцыйная генетыка* (рус. вучоны С. С. *Чаверыкоў*, англічанін Дж. С. Холдэйн), адкрыта *поліплаідыя* і вывучана яе значэнне ў жыцці арганізмаў (сав. генетыкі Р. Дз. Карпечанка, В. В. Сахароў, А. Р. *Жэбрак*). Дасягнуты вялікія поспехі ў галіне селекцыі пладовых культур (сав. вучоны І. У. *Мічурын*, М. В. Цыцын і інш.), даследавана значэнне ядра і цытаплазмы ў развіцці полу і кіраванні ім (сав. генетык Б. Л. *Астаураў*). Сусветнае прызнанне атрымала вучэнне сав. вучонага М. І. *Вавілава* пра цэнтры паходжання культурных раслін і яго тэорыя гамалагічных радоў спадчыннай зменлівасці. У эвалюц. марфалогіі створана вучэнне пра арамарфозы (сав. біёлаг А. М. *Северцаў*), фактары эвалюцыі і паходжанне паземных названочных жывёл (сав. заолаг І. І. *Шмальгаўзен*). Сучасны этап Б. — штучны сінтэз бялкоў і інш. біял. актыўных рэчываў (немец Э. Фішэр і інш.), эксперымент. даследаванне прадукцыйнасці экалагічных сістэм (сав. біёлагі Э. П. Одум, У. М. Сукачоў). У сярэдзіне 20 ст. на аснове біяхіміі, малекулярнай Б. і з дапамогай электроннай мікраскапіі расшыфраваны код спадчыннасці і даказана роля дэзоксірыбануклеінавай (ДНК) і рыбануклеінавай (РНК) к-т у перадачы спадчынных прыкмет і біял. сінтэзе бялкоў (амерыканец Дж. Б. Уотсан і інш.). Створаны тэорыі паходжання жыцця на Зямлі (сав. вучоны А. І. *Апарын*, англічанін Дж. Бернал), раскрыты біяхім. механізм мышачнага скарачэння (сав. біяхімік У. А. *Энгельгарт*). Вялікае дасягненне заалогіі беспазваночных жывёл — адкрыццё і вывучэнне новага тыпу паганафораў (сав. заолаг А. В. Іваноў), вучэнне пра прыродную ачаговасць трансмісійных хвароб чалавека і жывёл (сав. паразітолагі Я. Н. *Паўлоўскі*, Б. Я. *Быхоўскі*), даследаванні па біялогіі паразітаў чалавека і жывёл (сав. вучоны К. І. *Скрабін*). Распрацавана эвалюц. сістэматыка і марфалогія раслін (рус. батанікі У. Л. *Камароў*, Б. М. *Коза-Паляпскі*, М. І. Галенкін і інш.). Паспяхова развіваецца касмічная Б., якая вывучае ўплыў стану блізкавакасці і ўсіх асаблівасцей касм. прасторы на жыццядзейнасць чалавека і інш. жывых істот.

У БССР развіццё Б. пачалося пасля Кастр. рэвалюцыі. Даследаванні праводзіліся ў Ін-це бел. культуры, Ін-це біялогіі АН БССР, вядуцца ў адпаведных ін-тах АН БССР, ВНУ, прыкладных ін-тах і станцыях. Вядомы даследаванні глебавай эпзімалогіі і дзеяння фізіялагічна актыўных рэчываў глебы на працэсы росту і формаўтварэння ў раслін (В. Ф. *Купрэвіч*), па фотасінтэзе раслін і іх пігментаў (Ц. М. *Годнеў*, М. М. *Ганчарык*). Створана 5-томная «Флора БССР» (М. П. *Тамін* і інш.). Вядомы работы па інтрадукцыі, пладанашэнні і біялогіі дрэвавых раслін (М. Дз. *Несцяровіч*). Распрацаваны геабатанічнае і лесараслінпае раяніраванне, класіфікацыя тыпаў лесу БССР (І. Д. *Юркевіч*). Даследавалася выкарыстанне дзікаросласх кармавых і тэхп. раслін (М. У. *Смольскі*), эканоміка лесу (В. І. *Пераход*), біяхімія бульбы і інш. раслін (А. С. *Вечар*), дзеянне каранёў раслін на глебу (С. А. *Самцэвіч*). Распрацоўваюцца навук. асновы гетэрозісу (М. В. *Турбін*), колькасныя заканамернасці спадчыннасці, мутацыі, выкліканыя хім. рэчывамі (П. Ф. *Ракіцкі*) і іанізавальнымі выпрамяненнямі (Турбін). Усебакова вывучаюц-

ца працэсы фотасінтэзу ў малекуле хларафілу, цэнтры актыўнасці гэтай малекулы і механізмы перадачы энергіі ў макрамалекулах (Годнеў, А. А. *Шлык* і інш.). Бел. вучоныя высвятляюць відавы склад, спосабы жыцця, экалогію і практычнае значэнне млекакормячых, птушак і рыб рэспублікі (А. У. *Фядзюшын*, М. Е. *Макушок*, І. М. *Сяржанін*, С. В. *Кахненка*, П. І. *Жукаў* і інш.). Выяўлены заканамернасці біял. прадукцыйнасці вадаёмаў і спосабы ачышчэння забруджаных водаў у біял. сажалках, біял. асновы ўгнаення рыбагаспадарчых вадаёмаў (Г. Г. *Вінберг* і інш.). Даказана існаванне асобага тыпу адчувальных нервовых правадніковў, якія з'яўляюцца асновай вегетатыўных рэфлексаў, што замыкаюцца ў перыферычных нервовых вузлах і цэнтр. нервовай сістэме, вызначаны іх уласцівасці і сувязі з рухавымі нервовымі элементамі (І. А. *Булыгін*), вывучалася будова перыферычнай нервовай сістэмы, абгрунтаваны метады стварэння новых нервова-сасудзістых шляхоў пры парушэнні цэльнасці спіннога мозгу (Д. М. *Голуб*). Дасягнуты значныя поспехі ў фізіялогіі і тэрапіі сардэчна-сасудзістай сістэмы (І. Да. *Мішэнін*, Б. І. *Трусевіч*, М. І. *Арычын*). Вызначаны ўплыў выключэння знешніх аналізатараў на функцыі некат. унутраных органаў і абменныя працэсы (А. Ю. *Бранавіцкі*). Распрацавана тэрапія рассеянага склерозу (Д. А. Маркаў), выпайдзены новыя метады лячэння скурных хвароб (А. Я. *Пракапчук*). Распрацаваны метады ажыўлення несапраўдна памерлых нованароджаных (І. С. *Лягенчанка*, Л. С. *Персіянінаў*), аператыўныя метады лячэння мачаполавай сістэмы (М. Я. *Сабчанка* і інш.), вывучаны абмен мікраэлементаў у норме і пры хваробах (В. А. *Ляонаў*), біяхім. працэсы ў нервовай сістэме пры паражэннях выпрамяненнем (Л. С. *Чаркасава* і інш.). Вядомы даследаванні ў галіне аграхіміі (А. К. *Кедраў-Зіхман*, В. І. *Шэмпель*, С. Н. *Іваноў*, Т. Н. *Кулакоўская*), па зялёных угнаеннях (Я. К. *Аляксееў*). Праведзены даследаванні глебаў Беларусі (П. П. *Рагавой*, Я. М. *Афанасьеў*, І. С. *Лупіновіч*, І. Ф. *Гаркуша*, А. Р. *Мядзведзеў*), вядуцца інтэнсіўныя працы па меліярацыі і выкарыстанні тарфяна-балотных глебаў (С. Г. *Скарапанаў* і інш.), па ахове с.-г. расцін ад хвароб (М. А. *Дарожкін*), па селекцыі высокапрадукцыйных сартоў збожжавых, крупяных раслін, бульбы, агародніны, плодовых і ягадных культур (П. І. *Альсмік*, А. І. *Лапо* і інш.), па вывядзенні новых парод с.-г. жывёл (М. М. *Замяцін*). Абгрунтаваны прынцыпы стварэння меліярацыйных машын і рэжыму іх працы (М. Я. *Мацапура*). Распрацаваны пытанні прафілактыкі і ліквідацыі бруцэлёзу і туберкулёзу с.-г. жывёл (М. К. *Юскавец*), вет. санітарыі (Х. С. *Гараглад*), ліквідацыі ачагоў асн. гельмінтозаў (Р. С. *Чабатароў* і інш.). Вывучана паразіталагічная сітуацыя на тэр. рэспублікі, выяўлены новыя хваробы с.-г. і прамысл. жывёл, распрацавана сістэма мерапрыемстваў па барацьбе з імі. На навук. аснове грунтуецца ахова прыроды Беларусі, узнаўленне і рэканструкцыя яе багацця ў. Гл. таксама *Біялагічныя часопісы*.

Літ.: Развитие биологии в СССР, М., 1967 (бібліягр.); Наука БССР за 50 год, Мн., 1968; Опарин А. И. Жизнь, её природа, происхождение и развитие, 2 изд., М., 1968; Лункевич В. В. От Геродота до Дарвина. Очерки по истории биологии, 2 изд., т. 1—2, М., 1960; Вилли К. Биология, пер. с англ., М., 1968 (бібліягр.).

М. І. Дылько, У. П. Ляхновіч, Р. С. Чабатароў. Мінск.

БІЯМАСА (*бія...* + лац. massa глыба), колькасць рэчыва жывых арганізмаў, выражаная ў грамах на адзінку паверхні (1 $м^2$) або на адзінку аб'ёму (1 $м^3$). Адрозніваюць Б. бактэрый, раслінная і жывёльнага планктону, раслінных і жывёльных арганізмаў усёй зямлі і інш. Залежыць Б. ад тэмпаў размнажэння і гібелі арганізмаў, ад асяроддзя. У морах і акіянах пераважаюць жывёльныя арганізмы (найб. велічыня Б. ў донных жывёл), на сушы — раслінныя (найбольш раслін у вільготных трапічных лясах). Вызначаецца Б. ўзважваннем або множаннем колькасці жывых арганізмаў на сярэднюю вагу асобіны.

БІЯМЕТРЫЯ, варыяцыйная статыстыка, біялагічная статыстыка (*бія...*+грэч. metreō вымяраю), навука пра ўжыванне матэматычных метадаў у вывучэнні з'яў жыцця. Прадугледжвае выкарыстанне метадаў матэм. статыстыкі і інш. галін матэматыкі. Масавыя з'явы ў біял. працэсах абумовілі перавагу стат. метадаў і падыходаў у вывучэнні гэтых працэсаў. Прадмет Б.— зменлівыя прыкметы арганізмаў.

Зменлівасць любой прыкметы заўсёды заканамерная. Асн. параметры (паказчыкі) характарыстыкі біял. сукупнасці — сярэдняе арыфметычнае і сярэдняе квадратычнае адхіленні. Размеркаванне варыянтаў (прыкмет, што мяняюцца) у сукупнасцях бывае нармальнае (паказвае размеркаванне асобін па колькасных прыкметах), бінамінальнае (характарызуе якасныя прыкметы) і пуасонавае (адлюстроўвае рэдкую з'яву). Сувязі паміж зменлівымі прыкметамі вывучаюць метадамі простай, частковай і множнай карэляцыі, а таксама рэгрэсіі (выяўляюць залежнасць значэння адной велічыні ад другой) — прамалінейнай і крывалінейнай. Дысперсійны аналіз служыць для вызначэння ўплыву розных фактараў на зменлівасць прыкмет. Верагоднасць вынікаў даследаў або назіранняў вызначаюць з дапамогай памылкі стат. паказчыкаў. Верагоднасць характарызуецца імавернасцю (p). В. мае дапаможнае значэнне пры рашэнні тэарэт. і практ. задач біялогіі і сумежных дысцыплін. Б. як навука аформілася ў 1901, калі ў Лондане пачаў выдавацца час. «Biometrika» («Біяметрыка»). Заснавальнікамі яго былі матэматык К. Пірсан і біёлагі Ф. Гальтан і У. Уэлдан. У СССР выкарыстанню і развіццю Б. спрыялі працы А. А. Сапегіна, Ю. Л. Паморскага, У. І. Раманоўскага і інш.

Літ.: Рокицкий П. Ф. Биологическая статистика, Мн., 1967; Урбах В. Ю. Биометрические методы, М., 1964.

П. Ф. Ракіцкі. Мінск.

БІЯМЕХАНІКА (*бія...*+ грэч. mechanē машына, прылада), галіна фізіялогіі, якая вывучае статыку, кінематыку і дынаміку арганізмаў жывёл і чалавека на падставе тэарэтычнай і прыкладной механікі, анатоміі і фізіялогіі.

Аўтар першых прац па Б.— Леанарда да Вінчы (15 ст.). З пачаткам і развіццём *біёнікі* і *касманаўтыкі* шырэй разгарнуліся і даследаванні па Б. Задача Б.— біядынамічны аналіз рухаў,

лікі выяўляе сілы, што дзейнічаюць, іх крыніцы, умовы, эфектыўнасць і інш. Б. стварае падолі механізму рухаў і ўжываецца ў рацыяналізацыі працоўных працэсаў, спорце, мастацкім майстэрстве, у прагназаванні (прагназы, якія маюць уласцівасць адчуваць) і аўтаматыцы (канструяванне робатаў і складаных аўтаматаў біялагічнага характару). Асн. раздзелы Б.: дынамічная анатомія, Б. рухальных актаў, тэорыя каардынацыі рухаў, біяэрадынаміка і біягідрадынаміка. Вывучэнне Б. рухаў у зменлівых умовах (гравітацыйныя перагрузкі, бязважкасць і інш.) памагае авіяцыі і касманаўтыцы.

Літ.: Бернштейн Н. А. Общая биомеханика, М., 1926; Ягодинский В. В. Биомеханика, М., 1947; Донской Д. Д. Биомеханика физических упражнений, 2 изд., М., 1960; Тихонравов М. К. Полет птиц и машины с машущими крыльями, 2 изд., М., 1949; Гладков Н. А. Биологические основы полета птиц, М., 1949; Алеев Ю. Г. Функциональные основы внешнего строения рыбы, М., 1963; Биомеханика, у кн.: Вопросы бионики, М., 1967.

В. І. Абухаў. Мінск.

БІЯМІЦЫН, лякарства з групы *антыбіётыкаў*. Прадукт жыццядзейнасці мікраарганізма — прамяністага грыбка (Actinomyces aureofaciens). Жоўты крышталічны парашок, горкі на смак. Ужываецца ўнутр (таблеткі і капсулі) ад пнеўманіі, ганарэі, дызентэрыі, сыпнога тыфу і інш. хвароб, а таксама ў мазі супраць гнайнічковых хвароб скуры, апёкаў і інш. Проціпаказаны пры павышанай адчувальнасці арганізма да яго.

БІЯСІНТЭЗ (*бія...* + грэч. synthesis спалучэнне), утварэнне арганічных злучэнняў у жывых арганізмах. Зялёныя расліны і некат. бактэрыі сінтэзуюць складаныя арган. рэчывы з вуглякіслага газу і вады, выкарыстоўваючы сонечную энергію *(фотасінтэз)* або энергію акіслення неарган. злучэнняў *(хемасінтэз)*. Усе інш. арганізмы выкарыстоўваюць гатовыя арган. рэчывы як матэрыялы і крыніцу энергіі для свайго Б., што ідзе з удзелам ферментаў пры пэўнай т-ры, ціску і pH асяроддзя. Асаблівасць Б.— шматступеннасць і здольнасць да самарэгуляцыі.

Б. вугляводаў адбываецца пры фотасінтэзе з удзелам прамяністай энергіі ў хларапластах раслін; вада акісляецца да кіслароду, які выдзяляецца; вуглекіслата далучаецца да рыбулёзадыфасфату; гэтае злучэнне ператвараецца ў дзве малекулы фосфагліцэрынавай к-ты. Апошняя ўзнаўляецца ў фосфатрыёзы — фосфагліцэрынавы альдэгід і фосфадыоксіацэтон. Ад дзеяння ферменту альдалазы фосфатрыёзы ўтвараюць фосфагексозу — фруктозадыфасфат, які можа ператварацца ў гексозы (глюкозу, манозу, галактозу). Гексозы — першапачатковы матэрыял для Б. складаных вугляводаў (цукрозы, крухмалу, глікагену, цэлюлозы і інш.). Жывёльныя арганізмы атрымліваюць вугляводы з ежай (пераважна ды- і поліцукрыды — цукроза, крухмал) або сінтэзуюць іх з прадуктаў распаду бялкоў і ліпідаў. Вугляводы ў стрававальных органах расшчапляюцца на монацукрыды і разносяцца крывёю ў тканкі, дзе расходуюцца або ідуць на ўтварэнне глікагену.

Першапачатковыя матэрыялы для Б. ліпідаў — тлустыя к-ты, утвораныя з воцатнай к-ты і гліцэрыны. Пад уплывам ферменту ліпазы гліцэрына і тлустыя к-ты ўзаемадзейнічаюць і даюць ліпіды.

Бялкі сінтэзуюцца з *амінакіслот*. Інфармацыя пра паслядоўнасць размяшчэння амінакіслот у малекулах бялкоў закладзена ў паслядоўнасці нуклеатыдаў ДНК. Калі ў клетку ўзнікае патрэба ў бялку, на ДНК з дапамогай ферменту РНК-палімеразы ўтвараецца інфармацыйная РНК (і-РНК), што нясе інфармацыю пра структуру пэўнага бялку. І-РНК злучаецца з рыбасомамі, на якіх адбываецца зборка бялковых малекул, і ўтвараецца палісома. Туды паступаюць амінакіслоты. Яны дастаўляюцца толькі пэўнымі транспартнымі РНК (т-РНК). На паверхні рыбасом малекулы т-РНК знаходзяць адпаведныя ім участкі ў паслядоўнасці нуклеатыдаў і-РНК, з якімі ўзаемадзейнічаюць. Пры гэтым злучаюцца паміж сабой і амінакіслоты, што транспартуюцца суседнімі т-РНК. У выніку паступова нарошчваецца ланцуг амінакіслот з паслядоўнасцю, адпаведнай паслядоўнасці нуклеатыдаў у і-РНК (гл. *Генетычны код*). Гатовы поліпептыдны ланцуг — аснова бялковай малекулы — вызваляецца з палісомнага комплексу.

Першапачатковы матэрыял для Б. нуклеінавых кіслот — пурынавыя і пірымідзінавыя асновы, пентозы, фосфарная к-та. Пры Б. ДНК два камплементарныя ланцугі, якія ўтвараюць малекулу ДНК, разыходзяцца, і кожны адзіночны ланцуг служыць матрыцай для ўтварэння на ёй новага камплементарнага ланцуга. Фермент ДНК-палімераза ў прысутнасці адналанцуговай матрыцы злучае паміж сабой манамерныя папярэднікі ДНК (пурынавыя і пірымідзінавыя асновы). Утвораныя ланцугі злучаюцца вадародными сувязямі з першапачатковымі матрыцамі і атрымліваюцца дзве двухцяжавыя малекулы ДНК, ідэнтычныя першапачатковай малекуле. Пры Б. РНК капіруецца толькі адзін з двух ланцугоў ДНК; працэс полікандэнсацыі манамераў каталізуецца ферментам РНК-палімеразай. У жывых арганізмах сінтэзуюцца таксама гармоны, вітаміны, парфірыны і інш. арган. рэчывы.

Літ.: Биосинтез белка и нуклеиновых кислот, М., 1965; Вреслер С. Е. Введение в молекулярную биологию, 2 изд., М.— Л., 1966; Биосинтез белка и его регуляция, пер. с англ., М., 1967; Грин Д. и Гольдбергер Р. Молекулярные аспекты жизни, пер. с англ., М., 1968.

В. М. Мержынскі. Мінск.

БІЯСФЕРА (*бія...* + грэч. sphâire шар), вобласць пашырэння жыцця на Зямлі, адна са сфер *геаграфічнай абалонкі*. Уключае трапасферу, гідрасферу і частку зямной кары да глыбіні 3—4 *км*. Мікраарганізмы ў нафтаносных водах выяўлены на глыбіні больш за 4,5 *км*. Дакладнае вызначэнне Б. як асобнай абалонкі Зямлі, населенай жывымі арганізмамі, даў сав. геахімік У. І. Вярнадскі. Б. характэрна надзвычайная інтэнсіўнасць і разнастайнасць біягеахімічных з'яў і працэсаў. Жывое рэчыва ўцягвае сонечную энергію ў кола прыродных працэсаў і прыводзіць у рух вялікія масы матэрыі. Менавіта зялёныя расліны ўлоўліваюць і назапашваюць энергію Сонца ў форме арган. злучэнняў, здольных да новых пераўтварэнняў. Арганізмы ўплываюць на працэсы развіцця зямной кары, гідра- і атмасферы, на ўтварэнне *асадкавых горных парод* і *асадкавых радовішчаў* карысных выкапняў, глебаў.

Літ.: Вернадский В. И. Биосфера, М., 1967.

І. П. Галай. Мінск.

БІЯТЛОН (ад лац. bi дзвюх + грэч. athlon барацьба; сучаснае зімовае двабор ства), лыжная гонка на 20 *км* са стральбой з вінтоўкі на чатырох агнявых рубяжах. Спартсмен робіць 5 стрэлаў на кожным агнявым рубяжы са становішча лежачы ці стоячы, а на апошнім — стоячы, без упору. Мішэні ставяцца звычайна на 3; 8; 13 і 18-м *км*; дыстанцыя стральбы адпаведна 250, 200, 150 і 100 *м*. За кожны промах налічваецца штраф 2 *мін*, які дадаецца да паказанага ў лыжнай гонцы часу. У праграму спаборніцтваў па Б. ўваходзіць таксама эстафетная гонка 4×7,5 *км* са стральбой на шарах. Спаборніцтвы па Б. ў СССР право-

дзяцца з 1958, на Беларусі з 1961. Сав. спартсмены — неаднаразовыя чэмпіёны свету і зімовых Алімп. гульняў па Б.

БІЯТОП (*бія...* + грэч. tópos месца), участак зямной паверхні (сушы або вадаёма) з аднатыпнымі абіятычнымі ўмовамі асяроддзя (рэльеф, глебы, клімат і інш.), які займае той ці іншы *біяцэноз*; неарганічны кампанент біягеацэнозу. Уласцівы пэўнаму Б. комплекс умоў вызначае відавы склад арганізмаў і асаблівасці іх існавання. Мяняецца ад уздзеяння біяцэнозу.

БІЯТЫТ (франц. biotite ад прозвішча франц. вучонага Ж. Б. Біо), мінерал, жалезіста-магнезіяльная слюда групы ліставых *сілікатаў* $K(Fe, Mg)_3(OH, F)_2 [AlSi_3O_{10}]$. Мае шмат розных прымесей. Чыста жалезістая разнавіднасць наз. лепідамеланам, магнезіяльная — флагапітам. Крышталі манаклінай сістэмы. Расшчапляюцца па тонкія лісточкі. Колер зеленавата-чорны, чорны. Прасвечваецца бурым або зялёным колерам. Бляск шкляны. Цв. 2—3; шчыльн. 2800—3200 *кг/м*^{3}. Пародаўтваральны мінерал вывергнутых і метамарфічных горных парод. Найбольшыя крышталі да 7 *м*^{2} у пегматытавых жылах. Практычнае значэнне ў буд-ве мае гідратаваны Б.— *вермікуліт*.

БІЯТЭХНІЯ (*бія...* + грэч. technē мастацтва, майстэрства), навука пра гадоўлю ў прыродных умовах дзікіх паляўніча-прамысловых і іншых карысных жывёл і рацыянальнае іх выкарыстанне.

Узнікла ў СССР у 30-я г. 20 ст. Упершыню курс Б. уключаны ў навуч. праграму 1929/30 у Маскоўскім пушна-футравым ін-це (чытаў праф. П. А. Мантэйфель). Гал. задачы Б.: распрацоўка пытанняў аховы, узнаўлення і рэгулявання колькасці карысных дзікіх жывёл; паляпшэнне ўмоў іх жыцця (падкормка, саланцы, вадапоі); рэгуляванне колькасці шкодных відаў — ваўкоў, рысяў, ястрабаў і інш. Даследуецца прыродны корм жывёл, магчымасці акліматызацыі, прыручэння і гібрыдызацыі, аптымальная шчыльнасць засялення тэрыторыі. Вызначаюцца мерапрыемствы, якія могуць забяспечыць стабільнае размнажэнне карысных дзікіх жывёл. Вывучэннем праблем Б. і ўкараненнем іх у практыку займаецца Усесаюзны НДІ паляўнічай гаспадаркі і зверагадоўлі (г. Кіраў). У БССР біятэхнічныя мерапрыемствы распрацоўваюцца ў Белавежскай пушчы і ў Бярэзінскім дзяржаўным запаведніку. Праводзяцца найбольш у запаведніках, заказніках і паляўнічых гаспадарках.

Літ.: Кузнецов В. А. Биотехнические мероприятия в охотничьем хозяйстве, М., 1967; Романов В. и Козло П. Зимняя подкормка кабана, «Охота и охотничье хозяйство», 1965, № 2; Haber A. Gospodarstwo łowieckie, Warszawa, 1961.

У. С. Раманаў. Мінск.

БІЯФІЗІКА, раздзел біялогіі, які вывучае фізічныя і фізіка-хімічныя заканамернасці біялагічных працэсаў і пачатковыя механізмы дзеяння фізічных фактараў на біялагічныя сістэмы. Б. цесна звязана з *біяхіміяй*, утвараючы комплексную навуку — *малекулярную біялогію* — аснову ўсіх інш. раздзелаў біялогіі. Разглядае энергетыку працэсаў, падмалекулярныя структуры, фізіка-хім. ўзаемадзеянні малекул (вадародныя сувязі, іонныя, Вандэрваальсаўскія ўзаемадзеянні). Асн. раздзелы Б.: малекулярная Б. (даследуе структуры фіз. і фізіка-хім. уласцівасцей макрамалекул і малекулярных комплексаў, характар сіл узаемадзеяння і энергетыкі гэтых працэсаў); Б. клеткі (вывучае фізіка-хім. асновы будовы і функцыі клетак, сувязь структуры клетачных арганел і мембран з іх функцыяй, заканамернасці каардынацыі клетачных працэсаў, мех., эл. ўласцівасці, энергетыку і тэрмадынаміку клетачных працэсаў); Б. працэсаў кіравання і рэгуляцыі (даследуе і мадэліруе прынцыпы і механізмы кіравання і самарэгуляцыі жыццёвых працэсаў). У 1940—60 інтэнсіўна развіваюцца многія раздзелы прыватнай Б.: Б. фотасінтэзу, зроку, мембран, мышачнага скарачэння і нервовай праводнасці, розных спецыялізаваных органаў і тканак, біямеханіка, біяакустыка, радыебіялогія.

Развіццю Б. спрыяе выкарыстанне фіз. і фізіка-хім. метадаў даследавання, мадыфікаваных для рашэння біял. задач: рэнтген-структурнага аналізу, аптычных метадаў (спектры паглынання, флюарэсцэнцыі і фосфарэсцэнцыі, спектры дзеяння, святлорассеяння, дысперсія аптычнага вярчэння і інш.), электронных мікраскапіі, ядзернага і электроннага парамагнітнага рэзанансу, высокадчувальных метадаў рэгістрацыі слабых светлавых патокаў, ультрацэнтрыфугавання, эл. вымярэнняў, вісказіметры і інш. У Расіі эпізадычныя даследаванні ў галіне Б. вяліся параўнальна даўно (Л. Эйлер, І. М. Сечанаў, К. А. Цімірязеў, А. П. Самойлаў, П. П. Лазараў, М. М. Шапернікаў), але значнае развіццё Б. атрымала толькі пасля Кастр. рэвалюцыі. У СССР пытанні Б. распрацоўваюцца ў Ін-це біял. фізікі, Ін-це малекулярнай біялогіі, фіз. хіміі АН СССР, Ін-це фізікі Сібірскага аддз. АН СССР, Маскоўскім ун-це (на кафедрах біяфізікі пры біёлагаглебавым і пры фіз. ф-тах) і ў інш. навук. установах АН СССР, АМН СССР, АН саюзных рэспублік.

У БССР работы па Б. вядуцца ў Лабараторыі біяфізікі і ізатопаў АН БССР (з 1957), Бел. дзярж. ун-це па кафедры біяхіміі і біяфізікі біял. ф-та і на кафедры ядзернай фізікі фізічнага ф-та (з 1963). Асн. кірункі даследаванняў — біяфізіка фотасінтэтычнага апарата (А. А. *Шлык* з супрацоўнікамі); энергетыка бялкоў (С. В. Коневў з супрацоўнікамі) і нуклеінавых к-т (А. М. Пісарэўскі з супрацоўнікамі). Найб. значныя дасягненні біяфізікаў: адкрыццё першаснай, другаснай і трацічнай структур многіх бялкоў і нуклеінавых кіслот; выяўленне кааператыўных уласцівасцей бялкоў у працэсе канфармацыйных ператварэнняў і біякаталізу; работы ў галіне тэрмадынамікі біял. аб'ектаў як адкрытых сістэм фізіка-хім. стану малекул хларафілу ў клетках (распрацоўваліся бел. вучонымі Ц. М. *Годневым*, А. А. Красноўскім, А. А. Шлыкам, Ф. Ф. Літвінам); даследаванне міграцыі энергіі ў біял. сістэмах і механізмаў спалучэння фотафізічных і фотахімічных стадый фотасінтэзу з удзелам электронна ўзбуджаных малекул хларафілу, малекулярна-энергетычных спосабаў назапашвання лабільнай хім. энергіі ў мікраэнергетычных сувязях АДН і спосабаў трансфармацыі гэтай энергіі ў мех., хім., асматычную і светлавую энергію або работу; вывучэнне будовы клетачных мембран і спосабаў іх функцыяніравання ў працэсах пранікальнасці і нервовай праводнасці, свабоднарадыкальных станаў і працэсаў.

Літ.: Биофизика, под ред. Б. Н. Тарусова и О. Р. Кольс, М., 1968; Пасынский А. Г. Биофизическая химия, 2 изд., М., 1968; Байер В. Биофизика, пер. с нем., М., 1962; Мартин Р. Введение в биофизическую химию, пер. с англ., М., 1966; Сетлоу Р. и Поллард Э. Молекулярная биофизика, пер. с англ., М., 1964.

С. В. Конеў. Мінск.

БІЯХІМІЯ, навука, якая вывучае хімічны састаў арганізмаў, уласцівыя ім хімічныя ператварэнні і энергетычныя працэсы, спалучэнне якіх складае аснову абмену рэчываў. Цесна звязана з *біяфізікай*, арганічнай, фіз. хіміяй і хіміяй высокамалекулярных злучэнняў. Падзяляецца на Б. жывёл і чалавека, Б. раслін і Б. мікробаў. Паводле метадаў, аб'ектаў вывучэння і практычнага дастасавання вылучаюць Б. тэхнічную, радыяцыйную, клінічную (медыцынскую), Б. фотасінтэзу і інш. Сучасная Б. ў даследаваннях карыстаецца метадамі спектрафотаметры, храматаграфіі, мечаных атамаў, ультрацэнтрыфугавання, электрафарэзу, гістахіміі, электроннай мікраскапіі і ўдасканаленым хім. мікрааналізам. Даследаванні вядуцца на ўзроўні малекулы, клеткі і арганізма. Вывучаюцца культуры бактэрый, тканкавыя культуры, з клетак вылучаюцца субклетачныя арганелы, і інш. Дасягненні Б. выкарыстоўваюцца для атрымання вітамінаў, гармонаў, антыбіётыкаў, кансервавання прадуктаў.

Хім. працэсы жывой прыроды яшчэ ў старажытнасці выкарыстоўваліся на практыцы (вінаробства, выпечка хлеба, выраб скур, прыгатаванне малочнакіслых прадуктаў, лякарстваў). Як навука ўзнікла ў 17 ст., канчаткова сфарміравалася ў канцы 19 — пач. 20 ст., калі былі даследаваны акісляльныя працэсы ў арганізмах, тканкавае дыханне, біял. каталізатары (ферменты), працэсы браджэння, вітаміны, спосабы злучэння амінакіслот у малекуле бялку і інш. Вялікае значэнне мелі працы рус. вучоных А. Я. Данілеўскага, А. М. *Баха*, У. І. Паладзіна, У. С. Гулевіча, С. М. Вінаградскага, С. П. Костычава і інш. У 20 ст. вывучаны амінакіслотны састаў і поліпептыдная будова бялкоў; высветлена прасторавая структура бялкоў міяглабіну, *гемаглабіну* і інш., складаная будова *нуклеінавых кіслот* (ДНК і РНК); распрацаваны асн. рэакцыі абмену — *гліколіз*, цыкл трыкарбонавых к-т, *арніцінавы цыкл*; грунтоўна вывучаны ператварэнні бялкоў, вугляводаў, тлушчаў арганізма ў працэсе абмену. Распрацоўвалі гэтыя пытанні вучоныя ўсяго свету, у т. л. і савецкія: У. А. *Энгельгарт*, А. І. *Апарын*, А. М. *Белазерскі*, А. Я. *Браўнштэйн*, А. У. *Палладзін*, С. Я. *Севярын*, Н. М. *Сісакян* і інш. У СССР біяхім. НДІ створаны: у 1921 Біяхім. ін-т Мін-ва аховы здароўя СССР, в 1935 ператвораны ў Біяхім. ін-т АН СССР (Масква); у 1925 Біяхім. ін-т, пасля Ін-т біяхіміі АН УССР (Харкаў); у 1945 Ін-т біялагічнай і мед. хіміі АМН СССР. Створаны ін-ты біяхіміі ў Арменіі, Узбекістане, Літве.

На Беларусі біяхім. даследаванні вядуцца з канца 19 ст. (клінічныя аналізы, вывучэнне вітаміну С, санітарна-гігіенічныя эксперыменты). У 1940—60 сталі вядомыя даследаванні Ц. М. *Годнева*, А. А. *Шлыка* па хларафіле, Ф. Я. *Бераштэйна* і В. А. *Ляонава* ў галіне мікраэлементаў, А. С. *Вечара* па вывучэнні раслінных пластыдаў, В. Ф. *Купрэвіча* ў галіне глебавых ферментаў, Л. С. *Чаркасавай* па радыяцыйнай Б. і Б. цэнтральнай нервовай сістэмы, М. Ф. *Мережынскага* ў галіне клінічнай Б., Ю. М. *Астроўскага* па вывучэнні вітамінаў. Біяхім. лабараторыі ў АН БССР, БДУ і сістэме Мін-ва аховы здароўя.

Навук. працы па Б. друкуюцца ў часопісах: «Биохимия», «Український біохімічний журнал», «Вопросы медицинской химии», «Успехи биологической химии» (СССР); «Biochemische Zeitschrift» («Біяхімічны часопіс», ГДР); «Journal of Biological Chemistry» («Часопіс біялагічнай хіміі», ЗША) і інш.

Літ.: Фердман Д. Л. Биохимия, 3 изд., М., 1966; Годнеў Ц. М. і Цярэнцьеў В. М. Фізіялогія і біяхімія раслін у БССР, у зб.: Навука ў Беларускай ССР за 40 год, Мн., 1958; Тарановіч Л. Е. і Чаркасава Л. С. Да гісторыі развіцця біяхіміі жывёл і чалавека ў Беларусі, там жа; Вечар А. С. і Чайка М. Ц. Біяхімічныя даследаванні раслін і раслінная сыравіны ў БССР, у зб.: Навука БССР за 50 год, Мн., 1968; Буланкин И. Н. Основоположник отечественной биохимии Александр Яковлевич Данилевский, Харьков, 1953.

Л. С. Чаркасава. Мінск.

БІЯХІНОЛ, лякарства, 8% суспензія падвойнага злучэння ёдгідрату хініну з ёдзістым вісмутам у нейтральным персікавым алеі. Процісіфілітычны сродак, ужываецца таксама ад чырвонай ваўчанкі, пры запаленнях цэнтральнай нервовай сістэмы. Прэпарат, падагрэты ў флаконе, уводзіцца ў мышцу. Проціпаказаны пры актыўнай стадыі туберкулёзу, хваробах нырак, гемарагічным дыятэзе.

БІЯЦІН (ад *бія...*), $C_{10}H_{16}O_3N_2S$, вітамін H, арганічнае рэчыва, малекула якога мае тыяфенавае кольца, злучанае з астаткамі мачавіны і валяр'янавай кіслаты. Бясколерныя ігольчастыя крышталі, растваральныя ў вадзе, устойлівыя да святла, разбаўленых кіслот і шчолачаў, т-ра плаўлення 230—232 °С. Упершыню атрыманы Ф. Кёглем і Б. Тэнісам (1935); хім. структура высветлена ў 1940. Утвараецца вышэйшымі раслінамі і мікробамі, сінтэзуецца лабараторна. Многа Б. ў печані, нырках, яечным жаўтку, памідорах, соі, дражджах, шпінаце. Уваходзіць у састаў ферментаў, якія рэгулююць абмен тлушчаў і бялкоў. Калі ў арганізме яго нестае, захворвае скура, з'яўляецца мышачная слабасць, параліч, выпадаюць валасы, затрымліваецца рост. Нястача Б. можа быць ад частага спажывання сырога яечнага бялку: у ім ёсць глікапратэід авідзін, злучэнне якога з Б. не ўсмоктваецца кішэчнікам. Авідзін разбураецца награваннем бялку да 100 °С. Чалавеку ў суткі трэба 0,010—0,025 *мг* біяціну.

Літ.: Гл. пры арт. *Вітаміны*.

БІЯЦЭНАЛОГІЯ (*бія...* + грэч. koinós агульны + *...логія*), раздзел *экалогіі*, які вывучае *біяцэнозы*, іх узнікненне, паходжанне і развіццё, будову і ўзаемаадносіны з навакольным асяроддзем, паміж сабою саміх біяцэнозаў і іх кампанентаў. Цесна звязана з біягеацэналогіяй (навука пра *біягеацэнозы*). Першапачаткова біяэкалагічны кірунак Б. развіваўся ў галіне гідрабіялогіі, што было выклікана тэарэт. цікавасцю і практ. патрэбамі рыбнай гаспадаркі. Пазней з'явілася фітацэналогія — вучэнне пра раслінныя згрупаванні. Сав. паразітолаг акад. Я. Н. *Паўлоўскі* распрацаваў вучэнне пра паразітацэнозы.

Літ.: Радкевич В. А. Животные и растения, Мн., 1968; Павловский Е. Н. О паразитологическом изучении биоценозов, у кн.: Паразиты и паразитозы человека и животных, Киев, 1965.

БІЯЦЭНОЗ (*бія...* + грэч. koinós агульны), прыродная або штучна ўтвораная сукупнасць арганізмаў (раслін, жывёл і мікраарганізмаў), якія насяляюць участак біясферы, удзельнічаюць у кругавароце рэчываў і маюць пэўныя адносіны паміж сабою і абіятычнымі фактарамі асяроддзя.

Тэрмін Б. прапанаваў ням. біёлаг К. Мёбіус (1877). Сав. геабатанік У. М. *Сукачоў* падкрэсліў неад'емнасць вялікага покрыва ад звязаных з ім згуртаванняў арганізмаў і ўвёў тэрмін *біягеацэноз*. (Б.— састаўная частка біягеацэнозу). Выдзяляюць сукупнасць раслін — фітацэноз і сукупнасць жывёл — зоацэноз. Б.— супярэчлівае адзінства ўзаемазвязаных працілеглых па тыпе харчавання і абмене рэчываў арганізмаў і іх біял. груп, якія з'яўляюцца ўмовай існавання адзін для аднаго і забяспечваюць трывалы кругаварот рэчываў у *біясферы*. Яму ўласцівыя разнастайнасць унутраных сувязей і рухомасць колькаснага складу. Замена аднаго Б. іншым (сукцэсія) — заканамерная з'ява. Адрозніваюць першасныя Б., якія склаліся без удзелення чалавека, і другасныя, што ўзніклі пад уздзеяннем людзей (лясы на месцы высечаных, вадасховішчы і інш.). Асобная катэгорыя — аграбіцэнозы, дзе комплексы асноўных кампанентаў сядома рэгулююцца чалавекам. Гл. *Аграфітацэналогія*.

Вывучэнне Б. мае значэнне для правільнага асваення зямель і водных прастораў. Разуменне рэгуляцыйных працэсаў у Б. дае магчымасць забіраць частку прадукцыі Б. без яго парушэння і знішчэння. Веданне сувязей, якія існуюць паміж кампанентамі паразітацэнозаў (сукупнасць паразітаў аднаго або групы органаў ці цэлага арганізма), кладзецца ў аснову прафілактыкі прыроднаачаговых хвароб чалавека і жывёл.

Літ.: Основы лесной биогеоценологии, под ред. В. Н. Сукачева и Н. В. Дылиса, М., 1964; Наумов Н. П. Экология животных, М., 1963; Макфедьен Э. Экология животных, пер. с англ., М., 1965; Дювиньо П. и Танг М. Биосфера и место в ней человека, пер. с франц., М., 1968.

М. І. Дылько. Мінск.

БІЯЭЛЕКТРОНІКА (біямедыцынская электроніка, біялагічная электроніка, біялагічнаі медыцынская электроніка), 1) раздзел тэхнікі, які вывучае выкарыстанне электронікі ў біялогіі і медыцыне. 2) Раздзел біялагічнай фізікі, які вывучае электронныя працэсы ў біял. аб'ектах. Межы Б. як самастойнай навукі яшчэ не вызначаны. У АН БССР у складзе лабараторыі электронікі група Б. ў 1963—67 даследавала электронныя працэсы, што ляжаць у аснове з'яў успрымання і генерацыі жывымі клеткамі радыечастотных палёў.

БІЯЭЛЕКТРЫЧНЫЯ ПАТЭНЦЫЯЛЫ (біятокі), эл. напружанні ў органах, тканках і асобных клетачных элементах жывых арганізмаў. Істотная прыкмета жыццядзейнасці тканкі. Дасягаюць 0,05—0,1 *в*.

Узнікненне эл. з'яў у мышцах упершыню наглядна паказаў італьян. фізіёлаг Л. Гальвані (1791). Рускі фізіёлаг М. Я. Увядзенскі вызначыў (1884) магчымасць тэлефанічна выслухоўваць токі дзеяння мышцаў і нерваў у чалавека. Важныя даследаванні Б. п. правялі І. М. Сечанаў, І. Р. Тарханаў, Дз. М. Насонаў і інш.

Адрозніваюць: патэнцыялы спакою (мембранныя) — токі паміж вонкавай (эл.-дадатнай) і ўнутранай (эл.-адмоўнай) паверхнямі мембраны клетак, паміж непашкоджанымі (дадатнымі) і пашкоджанымі (адмоўнымі) участкамі тканак; патэнцыялы дзеяння — эл.-адмоўныя ваганні, якія ўзнікаюць і хутка распаўсюджваюцца пры праходзе тканкі ад стану спакою да ўзбуджанасці або дзейнасці; метабалічныя патэнцыялы — устойлівыя рознасці Б. п., абумоўленыя абменам рэчываў. Біятокі ляжаць у аснове мышачных скарачэнняў, нервовых імпульсаў, сакраторнай актыўнасці залозаў. Яны знікаюць пры парушэнні акісляльных працэсаў, пры звязванні дыхальных ферментаў (напр., ад дзеяння наркотыкаў, цыянідаў і інш.). Рэгістрацыя Б. п. сэрца (электракардыяграфія), мозгу (эл.-энцэфалаграфія), мышцаў (эл.-міяграфія) шырока выкарыстоўваецца ў медыцыне. Яна памагае высвятляць многія складаныя пытанні псіхалогіі, спорту, касм. палётаў чалавека і інш.


Літ.: Физико-химические основы происхождения биопотенциалов, М., 1964; Воронцов Д. С. Общая электрофизиология, М., 1961; Современные проблемы электрофизиологических исследований нервной системы, М., 1964; Аринчин Н. И. Эволюционное и клиническое толкование электрокардиограммы и фаз сердечного цикла, Мн., 1966; Рэкер Э. Биоэнергетические механизмы, пер. с англ., М., 1967.


М. І. Арынчын. Мінск.

БЛАГАВЕШЧАНСК, горад, цэнтр Амурскай вобл. РСФСР. Прыстань на Амуры, чыг. ст. 128 тыс. ж. (1970). Засн. ў 1856 як Усць-Зейскі ваенны пост; з 1858 — Благавешчанск. Суднабудаванне, рамонт суднаў, дрэваапрацоўка (лесапільная, запалкавая, мэблевая ф-кі), мех. і аўтарамонтны з-ды, швейная і папяровая ф-кі, млынкамбінат. Ін-ты: пед., мед., с.-г.; агульнатэхнічны ф-т Хабараўскага політэхн. ін-та; 10 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

БЛАГАВЕШЧАНСКАЯ ЦАРКВА ў Віцебску, помнік старажытнарускай архітэктуры сярэдзіны 12 ст. Збудавана на левым беразе

Благавешчанская царква ў Віцебску. Агульны выгляд і план.





Заходняй Дзвіны на месцы былога гандлёвага пасада. Некалькі разоў перабудоўвалася. Захаваліся руіны. Мела ў плане выцягнуты прамавугольнік з вялікай сярэдняй апсідай, якая выступала наперад (вузкія бакавыя апсіды, не акрэсленыя знадворку, былі ўрэзаны ў сцены). Царква падзялялася 6 стаўпамі на 3 нефы, сярэдні быў намнога шырэйшы за бакавыя. У вах. частцы храма — хоры з усходамі ў тоўшчы сцяны. Акопныя праёмы з раструбамі. Бакавыя фасады падзялялліся плоскімі лапаткамі на 4 долі. Дэкор сцен — чаргаванне радоў цаглін-плінфаў (ад аднаго да чатырох) і жоўтага пясчаніку.

Літ.: История русского искусства, т. 1, М., 1953, с. 317; Всеобщая история архитектуры, т. 3, Л.—М., 1966, с. 586—587; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969, с. 21—22.

У. А. Чантурыя. Мінск.

БЛАГАВЕШЧАНСКІ Аляксей Сяргеевіч [н. 5(18).10.1909, Брэст-Літоўск], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. авіяцыі (1943). Герой Сав. Саюза (1938). З рабочых. Чл. КПСС з 1939. Скончыў ваен. школу лётчыкаў у Ленінградзе (1929). Удзельнік барацьбы Кітая супраць яп. захопнікаў (1937). Камандаваў авіяц. групай знішчальнікаў, зрабіў 73 баявыя вылеты, асабіста збіў 7 і ў групе больш за 20 варожых самалётаў. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну камандаваў знішчальным авіякорпусам. Удзельнічаў у баях на 1-м Прыбалтыйскім, Калінінскім, Ленінградскім, 1-м Укр. і 3-м Бел. франтах; у вызваленні Оршы, Віцебска, Мінска, Ліды, Маладзечна. Пасля вайны нач. Вышэйшай афіцэрскай школы паветр. бою, нач. управлення НДІ. Жыве ў Маскве.



БЛАГАВІЧЫ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Плясна. Цэнтр сельсавета і калгаса «Свята Кастрычніка». За 9 *км* на З ад Чавусаў, 40 *км* ад Магілёва, 13 *км* ад чыг. ст. Чавусы, каля шашы Магілёў — Чавусы (3 *км*). 523 ж., двароў 187 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, мед. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня. Помнік на брацкай магіле 620 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЛАГАНРАВАЎ Анатоль Аркадзевіч [н. 20.5(1.6).1894, с. Анькава Уладзімірскай губ.], савецкі вучоны ў галіне механікі, балістыкі і ўзбраення. Акад. АН СССР (1943). Герой Сац. Працы (1964). Ген.-лейтэнант артылерыі. Засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР (1940). Чл. КПСС з 1937. У 1916 скончыў Міхайлаўскае артыл. вуч., у 1924 Вышэйшую артыл. школу і ў 1929 Ваенна-тэхн. акадэмію. У 1929—46 выкладаў у Артыл. акадэміі ў Маскве (праф. з 1938). У 1946—50 прэзідэнт Акадэміі артыл. навук. З 1953 дырэктар Ін-та машынаznаўства АН СССР. З 1959 віцэ-прэзідэнт камітэта па касм. даследаваннях пры Міжнар. савеце навук. саюзаў, з 1963 старшыня камісіі па даследаванні і выкарыстанні касм. прасторы пры АН СССР. Працы па пытаннях механікі і ўзбраення. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі. Дзярж. прэмія СССР 1941.



Тв.: Основания проектирования автоматического оружия, М., 1940.

БЛАГОЕЎ Дзімітр (14.6.1856, в. Загорычане, Македонія — 7.5.1924), балгарскі рэвалюцыйны дзеяч. З бедных сялян. Цесна звязаны з рус. рэвалюц. рухам. У 1878—80 жыў у Адэсе, з 1881 вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. У 1883 стварыў адну з першых рус. с.-д. груп. У 1885 арыштаваны і высланы ў Балгарыю. Стаў адным з арганізатараў балг. сацыяліст. руху, вёў барацьбу з народніцтвам (брашура «Што такое сацыялізм і ці мае ён глебу ў нас?», 1891). Пад кіраўніцтвам Б. створана Балг. с.-д. партыя (1891). З 1897 да 1923 з перапынкамі рэдагаваў час. «Ново време», грамадска-паліт. і тэарэт. орган партыі рэвалюц. марксістаў. Барацьба Б. і яго паплечнікаў супраць балг. рэфармістаў («шырокіх сацыялістаў») прывяла да арганіз. разрыву з імі і стварэння ў 1903 Балг. рабочай с.-д. партыі («цесных сацыялістаў»), якая прыняла ўдзел у стварэнні 3-га Камуніст. Інтэрнацыянала, а ў 1919 перайменавана ў *Балгарскую камуністычную партыю*. Пакінуў багатую навук. спадчыну. У працах «Сацыялізм і рабочае пытанне ў Балгарыі» (1900), «Эканамічнае развіццё Балгарыі. Індустрыя ці земляробства?» (1903) даў глыбокі аналіз эканомікі краіны і становішча рабочага класа. Філас. працы (цыкл арт. «Дыялектычны матэрыялізм і тэорыя пазнання», 1903—04) вызначаюцца ваяўнічай партыйнасцю. Першы балг. гісторык-марксіст (фундамент. праца «Да гісторыі сацыялізма ў Балгарыі», 1906). Заснавальнік марксісцкай эстэтыкі ў Балгарыі (літ.-крытычныя артыкулы ў кн. «Грамадска-літаратурныя пытанні», 1901). Горача вітаў Кастр. рэв.



Тв.: Съчинения, т. 1—20, София, 1957—64.

Літ.: Христов Х. и Василев К. Димитр Благоев, М., 1958; Лихачева Л. П. Димитр Благоев. Биобиблиогр. указатель, М., 1950.

БЛАЖКО Андрэй Агеевіч (1895, в. Харавічы Дукорскай вол. Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 17.5.1920), арганізатар і кіраўнік *дукорскіх партызан*. З сялян. Чл. Ка-

муніст. партыі. Падлеткам парабкаваў. З 1915 матрос Балтыйскага флоту. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі. У 1919 наведаў радзіму, там яго застала польская інтэрвенцыя. З дапамогай Мінскага падпольнага парт. к-та стварыў партыз. атрад і стаў яго камандзірам. У доме Б. размяшчаўся штаб атрада. Па даносе правакатара польскія карнікі 3.5.1920 арыштавалі ў Дукоры і Харавічах групу партызанаў. 11 найбольш актыўных партызанаў, сярод іх і Б., акупанты расстралялі ва ўрочышчы Пушча. На іх магіле помнік.



Л. М. Лыч. Мінск.

БЛАЖЭВІЧ Іосіф Францавіч [13(25).9.1891, в. Навасёлкі Трокскага пав. Віленскай губ.— 16.3.1939], савецкі ваенны дзеяч, герой грамадзянскай вайны. З сялян. З 1913 у арміі, камандзір роты, батальёна, нач. падрыхтоўчых курсаў 5-й арміі Паўн. фронту, вучыўся ў Акадэміі Ген. штаба. Пасля Кастр. рэв. салдаты выбралі яго камандзірам палка. З 1.7.1918 у Чырв. Арміі, пам. камандзіра палка. З кастр. 1918 на Усх. фронце камандзір 1-га Волжскага стралк. палка, 1-й асобнай Сібірскай брыгады; 3-й брыгады 27-й стралк. дывізіі. Удзельнік вызвалення Златауста, Чэлябінска, Кургана, Петрапаўлаўска. Начальнік дывізіі: з ліст. 1919 — 27-й, з лют. 1920 — 59-й, з студз. 1921 — 1-й Туркестанскай, з ліст. 1921 камандуючы 1-й арміі Туркестанскага фронту, з вер. 1922 камандзір 16-га стралк. корпуса, потым Беларускага стралк. корпуса. З 1926 у штабе Чырв. Арміі — нач. упраўлення, інспектар па стралкова-тактычнай справе, інспектар і нам. начальніка ўпраўлення ППА. Выбіраўся кандыдатам у чл. ЦВК БССР (1925). Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга.



П. А. Селіванаў. Мінск.

БЛАЗАН, 1) прыбліжаны манарха ці феадала, які павінен быў весяліць гаспадара і гасцей. Прыдворныя блазны паявіліся ў Заходняй Еўропе ў 15 ст. У Расіі мода на іх пайшла з пач. 18 ст. 2) Дзейная асоба старажытных спектакляў кірмашовага, школьнага і інш. тэатраў. 3) Персанаж твораў У. Шэкспіра, П. Кальдэрона і інш. (у бел. драматургіі — Е. Міровіча).



Вялікая літара з вылвай блазна. «Біблія» Ф. Скарыны. 1517—19. Прага.

БЛАКАДА ВАЕННАЯ, ізаляванне варожай дзяржавы (групы дзяржаў), асобных груповак узброеных сіл, марскіх портаў, важных палітычных цэнтраў ці вялікіх ваенных гарнізонаў.

Мэта — спыніць папаўненне жывой сілы, падвоз ваен. тэхнікі, прадметаў забеспячэння, ваен. сыравіны, стварыць умовы для хуткага разгрому праціўніка ці вымушанай яго капітуляцыі. Паводле геагр. становішча аб'екта блакады, сіл і сродкаў яе ажыццяўлення В. в. можа быць сухапутная, паветраная, марская і мяшаная (сухап.-паветраная, паветрана-марская, сухап.-паветрана-марская); паводле маштабаў дзеянняў і задач — стратэгічная, аператыўная і тактычная. У В. в. могуць удзельнічаць сілы і сродкі ўсіх відаў узбр. сіл.

А. К. Кузуб. Мінск.

БЛАКАДА НОВАКАІНАВАЯ, метад лячэння, заснаваны на дзеянні раствору новакаіну на перыферычную нервовую сістэму. Распрацаваў сав. хірург А. В. *Вішнеўскі* ў 1929. Ён даказаў, што слабыя растворы новакаіну не толькі здымаюць боль, але і лечаць. Б. н. пры непраходнасці кішэчніка распрацаваў бел. хірург П. М. *Маслаў*. Гл. таксама *Абязбольванне*.

Б. н. паясніцную робяць пры запаленчых працэсах у брушной поласці, язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, непраходнасці кішэчніка, хваробах нырак і інш.; шыйную (вагасімпатычную) — каб папярэдзіць і лячыць лёгачнаплеўральны шок; прасакральную — пры запаленнях прамой кішкі і параректальнай клятчаткі, неўралгіі прамой кішкі і інш.; футлярную — пры пераломах касцей, апёках і абмаражэннях рук і ног, укусах змеяў; блакаду паводле Лорына — Эпштэйна (семевага канацыка ці круглай звязкі маткі) — пры выкідышах, каротк. блакаду — пры паверхневых запаленчых працэсах (панарыцый, фурункул і інш.).

Літ.: Вишневский А. В. и Вишневский А. А. Новокаиновая блокада и масляно-бальзамические антисептики как особый вид патогенетической терапии, 2 изд., М., 1952.

І. Б. Аляшкевіч. Мінск.

БЛАКІРОЎКА, сістэма прылад, механізмаў і сродкаў аўтаматыкі, якая не дапускае няправільнага кіравання абсталяваннем.

У залежнасці ад блакіровачных механізмаў падзяляецца на механічную, электрычную і электрамеханічную. Напр., каб не дапусціць адначасовага ўключэння дзвюх скорасцей у каробцы перадач, што прыводзіць да палому шасцярняў, у вузел пераключэння скорасцей ставяць блакіровачны механізм. У электраўстаноўках В. фіксуе рабочыя часткі элемента апарата ці схемы ў пэўным (рабочым ці нерабочым) становішчы, засцерагае ад дотыку да эл. абсталявання з высокім напружаннем, дае патрэбную паслядоўнасць уключэння і выключэння электраўстановак на эл. станцыях, падстанцыях, прадпрыемствах і ў быце. Напр., у ліфтах напружанне на схему кіравання падаецца толькі тады, калі зачынены дзверы кабіны і ўсе дзверы шахты на паверхах. На чыгунцы В. гарантуе бяспеку руху паязда, выключае магчымасць адначасовага ўключэння процілеглых сігналаў, не дае адначасова адкрыць дзверы кабіны і рухацца. Бывае аўтаматычная і паўаўтаматычная В. Аўтаблакіроўка — сістэма рэгулявання руху паяздоў на перагонах, пры якой кіраванне сігналамі робіцца аўтаматычна самімі паездамі. Паказанні светафораў залежаць ад стану невялікага адрэзка чыг. пуці (блок-участка). Калі на блок-участку няма рухомага саставу, пуцявое рэле знаходзіцца пад токам і светафор паказвае зялёны (дазваляльны) сігнал. Пры занятасці пуці колавыя пары саставу замыкаюць рэйкавы ланцуг, пераключаецца пуцявое рэле і ўключаецца чырвоны сігнал. Пры паўаўтаматычнай В. выхадныя і прахадныя сігналы семафораў і светафораў уключаюцца з дапамогай блок-апаратаў і блок-механізмаў, устаноўленых на станцыях, пуцявых пастах і злучаных між сабою правадамі.




Схема аўтаблакіроўкі: *1* — ізаляцыйны стык; *2* — рэйкі; *3* — колавая пара; *4* — зялёны сігнал светафора; *5* — чырвоны сігнал светафора; *6* — стрыжань пуцявога рэле; *7* — якар пуцявога рэле; *8* — сігнальная батарэя; *9* — рэгулявальнае супрацівленне; *10* — пуцявая батарэя.

Літ.: Вахнин М. И. и др. Путевая блокировка и авторегулировка, М., 1966; Чернев К. К. Безопасные способы работы в электроустановках, М.—Л., 1966.

БЛАКІТНІЦЫ, два віды птушак роду сініц атрада вераб'іных. Даўж. да 13,5 *см*, маса каля 12 *г*. Апярэнне мяккае, пушыстае, белае, шаравата-зялёнае з жоўтым, блакітным і чорным. Пашыраны ў Еўропе, Азіі і Паўн. Афрыцы. Жывуць у мяшаных і ліставых лясах. Гняздуюцца ў дуплах. Нясуць да 15 яец. Кормяцца насякомымі. На Беларусі (асабліва на Палессі) найчасцей трапляецца блакітная Б. (Parus coeruleus) — аселая птушка. Белая Б., або князёк (P. cyanus) — рэдкая птушка заліўных лясоў. Увосень і зімою вандруе чародкамі з інш. сініцамі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Птушкі*.

БЛАКІТНЫ КІТ, сіні кіт, вялікі паласацік, гл. *Вязубыя кіты*.

БЛАКІТНЫЯ АЗЁРЫ, пашыраная сярод турыстаў назва маляўнічай групы з 14 азёраў у верхняй частцы бас. р. Страчы (прыток Віліі), на мяжы Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абл. Найбольш вядомыя — *Балдук, Глубля, Глубелька*.

БЛАН (Blanc) Луі (29.10.1811, Мадрыд — 6.12.1882), французскі сацыяліст-утапіст, гісторык, дзеяч рэвалюцыі 1848. У 1839—40 надрукаваў твор «Арганізацыя працы» (рус. пер. 1926) — утапічны план пераўтварэння капіталіст. грамадства сумеснымі намаганнямі пралетарыяту і часткі буржуазіі. Пасля лютаўскага перавароту 1848 увайшоў у бурж. ўрад. Сваёю згодніцкай палітыкай шкодзіў рабочаму руху, варожа паставіўся да *чэрвеньскага паўстання 1848* парыжскага пралетарыяту. У 1848—70 у эміграцыі. У 1847—62 надрукаваны найб. значны твор Б. «Гісторыя французскай рэвалюцыі» (рус. пер. т. 1—12, 1907—09). Выбраны ў Нац. сход (1871), адмовіўся далучыцца да Парыжскай камуны, ацынуўся сярод яе ворагаў. Увайшоў у гісторыю як пачынальнік *апартунізму*.

Літ.: Маркс К. Класавая барацьба ў Францыі з 1848 па 1850, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; Ленін У. І. Лулбланаўшчына, Тв., т. 24 (Полн. собр. соч., т. 31); Яго ж. «Вялікі адыход», Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 32).

БЛАНКІ (Blanqui) Луі Агюст (8.2.1805—1.1.1881), французскі рэвалюцыянер, утапічны камуніст. Удзельнік рэвалюцый 1830 і 1848, заснавальнік некалькіх тайных таварыстваў. У 1839 і 1870 спрабаваў ажыццявіць пераварот у Францыі, але без поспеху. Двойчы прыгаворваўся да смерці, 37 гадоў быў зняволены. У 1871 завочна выбраны чл. Парыжскай камуны. Светапогляд Б. склаўся пад уплывам механістычнага матэрыялізму, атэізму і рацыяналізму 18 ст., а таксама утапічнага сацыялізма. Б. лічыў, што будучаму грамадству павінен папярэднічаць перыяд дыктатуры групы рэвалюцыянераў, якія шляхам адукацыі прывядуць народ да камунізма. Поспех рэвалюцыі звязваў з добра падрыхтаванай арганізацыяй змоўшчыкаў. Б. не разумеў, што перамога рэвалюцыі магчымая толькі пры ўдзеле працоўных мас, якімі кіруе рэвалюц. партыя. Класікі марксізма-ленінізма адзначалі рэвалюц. заслугі Б. і крытыкавалі яго памылкі і заганнасць тактыкі. Бланкізм, паводле Леніна, «чакае вызвалення чалавецтва ад наёмнага рабства не шляхам класавай барацьбы пралетарыяту, а шляхам змовы невялікай інтэлігентнай меншасці» (Тв., т. 10, с. 362). Бланкізм у Расіі зрабіў уплыў на рэвалюц. народніцтва 70-х г.



Літ.: Маркс К. Класавая барацьба ў Францыі з 1848 па 1850, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; Ленін У. І. Урокі Камуны. Тв., т. 13 (Полн. собр. соч., т. 16).

БЛАСКА ІБАНЬЕС (Blasco Ibáñez) Вісентэ (21 ці 29.1.1867, Валенсія — 16.1.1928), іспанскі пісьменнік і паліт. дзеяч. Сын камерсанта. Лідэр леварэсп. руху ў Валенсіі. У 1898—1909 дэп. парламента. У 1914—18 падтрымліваў Антанту. Калі да ўлады прыйшла ваен. дыктатура, эмігрыраваў у Францыю (1923). Выступаў у падтрымку Сав. Рэспублікі. Літ. дзейнасць пачаў як журналіст (1885). У ранніх творах (раман «Майская кветка», 1895; аб. «Валенсіянскія апавяданні», 1896), напісаных пад уплывам натуралізму, спачувальна паказаў нар. жыццё, выкрываў сац. несправядлівасць. У рамане «Хутар» (1898) выступіў як сталы майстар крытычнага рэалізму. Аснова сюжэта раманаў «Таледскі сабор» (1903) і «Няпрошаны госць» (1904) — сац. антаганізм паміж народам і яго прыгнятальнікамі. У 1906—09 выдаў цыкл філас.-псіхалаг. раманаў «Аголеная маха», «Кроў і пясок», «Мёртвыя загадваюць», «Луна Бенамор». З 1910 адышоў ад сац. праблематыкі. Раманы «Чатыры коннікі Апакаліпсіса» (1916) і «Наша мора» (1918) з тэндэнцыйных, часам шавініст. пазіцый падаюць падзеі 1-й сусв. вайны. З пазнейшых твораў найбольш значныя памфлет «Альфонс XIII выкрыты» (1924) і раман пра Хрыстафора Калумба «У пошуках Вялікага Хана» (1928).

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв., т. 1—3, М.—Л., 1959.

БЛАСТУЛА (ад грэч. blastōs зародак), стадыя развіцця зародка шматклетачных жывёл, на якой канчаецца драбленне аплодненага яйца. Пры поўным радыяльным драбленні Б. мае форму пустога шара, абалонка якога складаецца з аднаго слоя клетак; пры частковым утвараецца дыскабластула, а пры спіральным Б. не мае поласці (стэрэабластула). Развіваючыся, Б. ператв. ў *гаструлу*.

БЛАЎМАН (Blaumanis) Рудольф Мацісавіч (1.1.1863, маёнтак Эрглі Ліфляндскай губ.— 4.9.1908), латышскі пісьменнік-рэаліст. Сын селяніна. Скончыў Рыжскую гандлёвую школу (1881), працаваў журналістам у Рызе і Пецярбургу. Друкавацца пачаў у 1881. Першы зб. апавяд. «Пры святле лучыны» (1893). Тонкі бытапісальнік лат. вёскі, псіхолаг, майстар стылю і кампазіцыі. Характары раскрывае праз складаныя перажыванні. Пісаў апавяданні і навелы («Пустазелле», 1887; «У Спіенах», 1888; «Раўдупіетэ», 1889; «Веснавыя замаразкі», 1898; «Андрыксон», 1899), п'есы (драмы «Злы дух», 1891; «Блудны сын», 1893; «Індраны», 1904; «У агні», 1905; камедыі «Дні краўцоў у Сілмачах», 1902, і інш.). Ідэйная абмежаванасць перашкодзіла Б. правільна ацаніць рэв. 1905. Вядомы і як паэт. Паліт. сатыра Б. асуджала ням. памешчыкаў, лат. буржуазію, царскае самаўладдзе.

Тв.: Kopoti raksti, т. 1—8, Rīga, 1958—60; рус. пер.— Избранное, М., 1959; Пьесы, М., 1959.

БЛАХІН Васіль Аляксандравіч [н. 17.2(2.3). 1914, в. Лабаны Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1936. З 15.8.1941 у партызанах, камандзір атрада; з 15.6.1943 камандзір батальёна; з крас. 1944 — *партызанскай брыгады імя А. Ф. Данукалава* («Аляксея») Віцебскай вобл. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Мінску.

БЛАХІН Фёдар Цімафеевіч [н. 29.10(11.11). 1903, в. Раманаўка Курмышскага пав. Сімбірскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. На фронце з сак. 1943; камандаваў сапёрным узводам. Вызначыўся 26.6.1944 пры вызваленні Віцебска. У час бою на чале групы байцоў уварваўся на гарадскі мост цераз Зах. Дзвіну; за некалькі мінут да яго ўзрыву перарэзаў бікфордаў шнур і зняў эл. міну. У гонар Б. на месце ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Б.— ганаровы грамадзянін Віцебска. Жыве ў с. Пільва Горкаўскай вобл.

БЛЕДНАЕ, возера ў бас. р. Нарач, правага прытока Віліі, у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. Пл. 2,03 *км*². Даўж. 1,9 *км*, найбольшая шыр. 1,8 *км*, сярэдняя 1,1 *км*. Катлавіна круглявая, схілы спадзістыя, занятыя лугам, зараслі хмызняком і лесам. Вадазбор нізінны. Пераважаюць азёрныя пяскі і тарфянікі. Воз. эўтрофнага тыпу. Водзяцца плотка, шчупак, карась, акунь, лінь.

БЛЕДНАЯ ПАГАНКА (Amanita phalloides), ядавіты грыб сямейства мухаморавых. Шапка дыяметрам 7—10 *см*, у маладых грыбоў паўшарападобная, потым выпукла-распасцёртая. Скурка шапкі слабаслізістая, белаватая, бледна-зялёная або аліўкава-зялёная. Ножка белая з кольцам у верхняй частцы і вольвай (рэшткі агульнага покрыва) каля асновы. Б. п. вельмі падобная да ядомых грыбоў шампіньёнаў, адрозніваецца ад іх белым колерам нізу шапкі і наяўнасцю вольвы. Расце ў мяшаных і лісцевых лясах. Б. п. называюць таксама ядавітыя грыбы таго самага роду — А. шарра і А. virosa. Іл. гл. па ўкл. да арт. *Грыбы*.

БЛЕЙК (Blake) Уільям (28.11.1757, Лондан — 12.8.1827), англійскі паэт і мастак, папярэднік англ. рэвалюц. рамантызму. Сын гандляра. Працаваў гравёрам. У 1783 выдаў першы зб. вершаў «Паэтычныя накіды». Вітаў франц. бурж. рэв. канца 18 ст. (няскончаная паэма «Французская рэвалюцыя», 1791). Незразуметы і непрызнаны сучаснікамі, памёр у беднасці. Напісаў «Песні нявіннасці» (1789) і «Песні вопыту» (1794), зб. паэм «Праροцкія кнігі» (1789—1820), кн. сатыр. парадоксаў «Прыказкі пекла» (1793). У творчасці Б. духоўна-містычныя матывы спалучаліся з бунтарскімі і багаборніцкімі, візіянерства — з глыбокім дэмакратызмам, метафізіка — з дыялект. паказам прыроды як вечнага руху і абнаўлення. Ілюстраваў многія свае творы, «Боскую камедыю» Дантэ, «Начныя думы» Э. Юнга. На рус. мову вершы Б. перакладаў С. Маршак.

Літ.: Некрасова Е. А. Творчество Уильяма Блейка, М., 1962 (бібліягр.); Елистратова А. А. Наследие английского романтизма и современность, М., 1960.

БЛЕЎЧЫЦЫ, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., на р. Морач. Цэнтр сельсавета. За 21 *км* на Пд ад Капыля, 146 *км* ад Мінска, 13 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 768 ж., двароў 245 (1970). Міжкалгасная эл. станцыя. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЛЕКАТ (Hyoscyamus), род адна- і двухгадовых травяністых раслін сямейства паслёнавых. Сцябло клейкае, пушыстае, выш. 5—150 *см*. Лісце цэласнае ці перыстараздзельнае. Кветкі брудна-жоўтыя з сеткай фіялетавых жылак, у аднабокіх завітках. Плод — каробачка з шэра-бурым насеннем (да 500 каліў). Вядома 20 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і. У СССР 8 відаў, у БССР 2. Найбольш вядомы Б. чорны (H. niger), пар. назвы: дурнап'ян, зубнік, дур-трава, дыдар. Расце як пустазелле каля дарог, на пустэчах. Ядавіты (мае алкалоіды групы атрапіну, найбольш у насенні), з непрыемным пахам і смакам. Прэпараты з Б. ўжываюцца ў медыцыне і ветэрынарыі. Іл. гл. па ўкл. да арт. *Ядавітыя расліны*.

БЛІАДУХО Мікалай Фёдаравіч [28.11(10. 12).1878, Ігумен Мінскай губ.— 13.1.1935], беларускі савецкі геолаг. Арганізатар геал. службы БССР. Акад. АН БССР (1928), праф. БДУ (1926), заг. кафедры геалогіі БДУ (1923), дырэктар Ін-та геалогіі і гідрагеалогіі АН БССР (1929—35), старшыня Камісіі па вывучэнні прадукцыйных сіл рэспублікі (1926) і Прадстаўніцтва геал. камітэта на Беларусі (1929). Скончыў Пецярбургскі горны ін-т у 1903. Удзельнічаў у геал. экспедыцыях на Д. Усходзе і ў Сібіры. Адкрыў там радовішчы мармуру, даламіту, пірыту, бурага вугалю, каляровых металаў. З 1922 нач. Горнага аддзела Упраўлення СНГ Беларусі. Арганізаваў работы па геал. здымцы і разведцы карысных выкапняў рэспублікі. Узначальваў экспедыцыю па даследаванні Аршанскай, Магілёўскай і Калінінскай акруг. Вывучаў мелавыя адклады і фасфарыты на р. Сож. На аснове гэтых даследаванняў быў пабудаваны Крычаўскі цэментны з-д. Абгрунтаваў пастаноўку геафіз. даследаванняў і глыбокага бурэння ў Мінску, Полацку, Бабруйску, Даманавічах, бурэння на соль каля Давыдаўкі. Паводле вынікаў геамагнітнай здымкі разам з Я. Я. Сіроцінным даў прагноз на выяўленне жалезарудных канцэнтрацый у петрах БССР. Упершыню склаў геал. карты дачацвярцічных і чацвярцічных адкладаў, карысных выкапняў Беларусі. Удзельнічаў у стварэнні санаторыя на базе мінералізаваных водаў бабруйскай свідравіны.

Тв.: Сборник трудов по геологии и полезным ископаемым БССР, М., 1952.



БЛІЗАРУКАСЦЬ (міяпія, ад грэч. myōpía жмурыцца), недахоп зроку, пры якім добра відаць блізкія рэчы і дрэнна аддаленыя. Узнікае пайбольш у школьным узросце. Развіццю яе садзейнічаюць туберкулёз, ангіны, глісты, хворыя зубы і інш. хваробы, а таксама спадчынныя фактары. Пры цяжкай, злаякаснай Б. ўзнікаюць змены ў сятчатай і сасудзістай абалонках вока — расцяжэнні, атрафія, крывазліццё. У нармальным воку прамяні святла пасля пераламлення сходзяцца ў фокусе на сятчатцы, а пры Б.— перад сятчаткай і даюць невыразнае адлюстраванне. Блізарукія разглядаюць усё на блізкай адлегласці, ад гэтага стамляюцца вочы, часта развіваюцца мышачная і акамадацыйная астэнія, разыходная касавокасць, спазмы акамадацыі, пачынаюць «лятаць мушкі». Ускладненні: *катаракта*, адслойванне сятчатай абалонкі вока. Каб папярэдзіць Б., асабліва дзецям, трэба правільна сядзець у час заняткаў і сачыць за рацыянальным асвятленнем пры рабоце, нельга чытаць лежачы. Людзям з цяжкай Б. нельга фізічна перанапружвацца. Лячэнне: карэкцыя Б. акулярамі. Пры цяжкай форме ўжываюць оксігенатэрапію (ін'екцыі кіслароду над кан'юнктыву вока), вітаміпатэрапію (віт. B_1, С), біягенныя стымулятары (экстракт альясу, шклопадобнае цела), прэпараты ёду, кальцыю.

Літ.: Многотомное руководство по глазным болезням, под ред. В. Н. Архангельского, т. 1, кн. 1, М., 1962; Бирич Т. В. и Кантор Д. В. Особенности зрения человеческого глаза и очки, Мн., 1968.

Р. Я. Водзіева. Мінск.

БЛІЗКІ УСХОД, агульная назва краін, размешчаных на стыку Еўропы, Азіі і Афрыкі. Да краін Б. У. адносяць Аб'яднаную Арабскую Рэспубліку, Турцыю, Кіпр, Сірыю, Ірак, Ліван, Іарданію, Ізраіль, тэр. арабскай дзяржавы, Кувейт, Саудаўскую Аравію, Емен, Нар. Рэсп. Паўд. Емена, княствы на Аравійскім п-ве — Катар, Дагаворны Аман, Аман, Бахрэйн. Плошча краін Б. У. каля 6 млн. *км*², нас. каля 100 млн. чал. Часам да Б. У. адносяць і Судан.

БЛІЗНІЦА, вёска ў Вароніцкім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Блізніца. Цэнтр калгаса імя Сільніцкага. За 25 *км* на ПдЗ ад Полацка, 125 *км* ад Віцебска, 16 *км* ад чыг. ст. Фарынава. 211 ж., двароў 61 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, дом інвалідаў, магазін.

БЛІЗНЯТЫ, двое і больш дзяцей ад адной цяжарнасці. У сярэднім адна двойня прыпадае на 85 аднаплодных родаў, тройня — на 8000, больш многаплодныя роды бываюць вельмі рэдка. У краінах з умераным кліматам блізняты параджаюцца часцей, чым у паўднёвых.

Адрозніваюць аднаяйцовых і двух'яйцовых Б. Аднаяйцовыя развіваюцца з аднаго аплодненага яйца, калі ў аплодненай яйцаклетцы ёсць два зародкавыя ядры або калі аднаяйцовую клетку апладняе двух'ядравы сперматазоід. З аплодненай яйцаклеткі, якая мае некалькі ядраў, развіваюцца аднаяйцовыя тройні, чацверні і г. д. Аднаяйцовыя Б. маюць адну плацэнту, яны заўсёды аднаго полу і на выгляд вельмі падобныя. Пры няпоўным расшчапленні аднаяйцовага зародка Б. могуць нарадзіцца зросшыя (сіямскія Б. Чанг і Энг, багемскія сёстры Роза і Юзэфа Блажак). Двух'яйцовыя Б. развіваюцца ў выніку апладнення двюх яйцаклетак, маюць асобныя плацэнты і бываюць адна- і разнаполыя. Падабенства між імі невялікае. Прычыны шматплоднай цяжарнасці вывучаны недастаткова. Маюць значэнне спадчынная схільнасць аднаго з бацькоў, гармональныя зрухі ў арганізме жанчын. Часцей бывае пры паўторных цяжарнасцях і ва ўзросце 35—40 гадоў. Гл. таксама *Спадчыннасць*.

Літ.: Канаев И. И. Близнецы, М.—Л., 1959.

А. І. Дубовік. Мінск.

БЛІЗНЯТЫ (лац. Gemini), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Знаходзіцца ў паўн. паўшар'і неба, паміж сузор'ямі Рака і Цяльца. Найбольш яркія зоркі — Полукс і Кастар (адпаведна 1-й і 2-й зорнай велічыні). З тэр. БССР добра відаць увосень, зімою і вясною. Гл. *Зорнае неба*.

БЛІНДАЖ (франц. blindage)), фартыфікацыйнае збудаванне для ўкрыцця жывой сілы ад зброі масавага паражэння, авіябомбаў, артылерыйскага і мінамётнага агню. Будуецца з дрэва, цэглы, жалезабетону, а з паяўленнем атамнай зброі — і са спец. гатункаў сталі; пакрыццё засыпаецца грунтам таўшчынёй не менш за 90 *см*. Умяшчае 8—15 чал. Упершыню Б. выкарыстоўваліся пры абароне Севастопаля ў 1854—55.

БЛІНЧЫКАЎ Моталь Абелевіч [парт. псеўд. Л. Якаўлеў, Абрам Леў; 13(25).3.1896, мяст. Краслава Дынабургскага пав. Віцебскай губ.— 11.11.1935], дзеяч рэва-

люц. руху ў Зах. Беларусі. З рамеснікаў. Чл. КПСС з 1919. У 1912—15 вёў работу ў прафсаюзах Віцебска, быў пад уплывам Бунда. У 1916—17 займаўся рэвалюц. прапагандай сярод салдатаў. Двойчы быў пад арыштам. З 1919 у Чырв. Арміі, нам. начальніка палітаддзела 17-й дывізіі на Зах. фронце. З канца 1920 нам. наркома працы БССР. З ліст. 1921 на нелегальнай рабоце ў Зах. Беларусі, сакратар Беластоцкага падпольнага акр. к-та КПРП. У 1922 арыштаваны і зняволены на 6 гадоў. У 1928—35 чл. Бюро ЦК КПЗБ, узначальваў Крайвы сакратарыят ЦК КПЗБ, прадстаўнік ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. Дэлегат I (1928) і II (1935) з'ездаў КПЗБ, VI з'езду КПП (1932), VII кангрэсу Камінтэрна (1935). *М. С. Арэхва.* Мінск.

БЛІШЧ Міхаіл Андрэевіч [25.10(7.11).1917, в. Засна Рэчыцкага пав. Мінскай губ.— 9.5.1966], беларускі савецкі тэатральны мастак. Скончыўшы ў 1938 Віцебскае маст. вуч., працаваў у Бел. т-ры оперы і балета. Вучань С. Нікалаева. У Вял. Айч. вайну ўдзельнік партыз. руху. Сярод работ Б. вылучаюцца дэкарацыі да «Алека» С. Рахманінава (1949), «Доктара Айбаліта» М. Марозава (1951), «Марынкі» Р. Пукста (1955, усе ў Бел. т-ры оперы і балета); да «Пунсовай кветачкі» Л. Браўсевіч і І. Карнавухавай (1953, т-р імя Я. Купалы), «Гадоў вандраванняў» А. Арбузава (1954, Гомельскі драм. т-р). Дэкарацыям Б. ўласцівыя рамантычная прыўзнятасць, паэтычнасць, кампазіцыйная выразнасць.

БЛІШЧАНКІ (Nitidulidae), сямейства насякомых атрада жукоў. Цела сціснутае, даўж. да 0,5 *см*, мае металічны бляск. Вусікі булавападобныя, лапкі пяцічленікавыя. Усяго каля 2000 відаў, у СССР каля 230. Жывуць пад карою дрэў, на трупах. Шкодзяць раслінам, бо кормяцца пылком (напр., Б. рапсавая). Некат. віды карысныя — знішчаюць тлю, какцыдаў, алейрадзідаў, лічынак караедаў.

БЛОК (франц. bloc, англ. block), пагадненне, саюз дзяржаў, партый або інш. арганізацый для ажыццяўлення пэўных эканамічных, палітычных, ідэалагічных дзеянняў. У адносінах паміж імперыяліст. дзяржавамі пашыраны блокі, якія маюць на мэце ажыццяўленне агрэс. палітыкі: падрыхтоўку і развязванне войнаў, захаванне каланіялізму і задушэнне нац.-вызв. руху, разгром рэвалюцый і экспарт контррэвалюцый, насаджэнне антыкамунізму і процідзеянне росту сіл, што выступаюць за мір, дэмакратыю і сацыялізм. СССР і інш. сацыяліст. краіны ніраз выкрывалі агрэс. характар блокаў, заключаных імперыяліст. краінамі (НАТО — 1949, СЕАТО — 1954, СЕНТО — 1955, і інш.). Імперыяліст. краіны маскіруюць сапраўдныя мэты Б. спасылкамі на іх «абарончы характар». Стварэнне агрэс. Б. супярэчыць Статуту ААН і прынцыпам мірнага суіснавання дзяржаў.

Літ.: Смирнов Ю. и Софинский В. СЕАТО — агрессивный блок колониальных держав, М., 1957; Халоша В. М. Североатлантический блок, М., 1960; Акопов Г. М. и Сухарьков И. А. Империалистические блоки: реальность и перспективы, М., 1969. *Г. Г. Цернавая.* Мінск.

БЛОК (у тэхніцы), 1) найпрасцейшы механізм для падымання грузаў, асноўны элемент якога — кола з жолабам па акружнасці і перакінутым цераз яго канатам ці інш. гібкай цягай. Выкарыстоўваецца для змены кірунку сілы цягі (перухомы Б.) і для атрымання выйгрышу ў сіле ці ў скорасці (рухомы Б.), радзей — для перадачы вярчальнага моманту. Каб атрымаць большы выйгрыш у сіле ці скорасці, выкарыстоўваюць механізм з некалькіх Б.— паліспаст. 2) Сукупнасць збудаванняў, машын, механізмаў і іх частак (дэталяў), аб'яднаных у адну сістэму ці канструкцыю паводле свайго прызначэння, месца размяшчэння, агульнай загатоўкі і інш. Вядомы Б. будынкаў, сан. вузлоў, шпіндэльныя Б. станкоў, Б. цыліндраў рухавікоў унутр. згарання, Б. сілкавання ў радыёэлектроннай апаратуры і інш. 3) Штучны камень (бетонны, керамічны, сілікатны) геаметрычнай формы для буд-ва і дарожнага пакрыцця. Пашыраны сценавыя Б., якія падзяляюцца на малыя (умуроўваюцца ўручную) і вялікія (масай да некалькіх тон). Гл. *Буйнаблочныя канструкцыі.*

БЛОК Аляксандр Аляксандравіч [16(28).11.1880, Пецярбург — 7.8.1921], рускі паэт. З дваран. Выхоўваўся ў дзеда — рэктара Пецярбургскага ун-та А. М. Бякетава, вядомага вучонага-батаніка. Вучыўся на юрыд. і гістор.-філал. ф-тах Пецярбургскага ун-та (1898—1906). Пачаў друкавацца ў 1903. Эстэт. погляды Б. складваліся пад уплывам ідэаліст. філасофіі У. Салаўёва і паэтыкі сімвалізму («Вершы пра Прыгожую Даму», 1904). Напярэдадні рэв. 1905 у паэзіі Б. загучалі сац. матывы, паявілася тэма горада («Фабрыка», «З газет», «Барка жыцця»), спагадліва сустрэў рэвалюцыю («Мітынг», «Сытыя», лірычная драма «Кароль на плошчы»). У драме «Балаганчык» (1906) асуджае дэкадэнцкі містыцызм. Творчасць Б. пераджастр. дзесяцігоддзя складаная і супярэчлівая, прасякнута пачуццямі адзіноты і расчаравання (зб. «Нечаканая радасць», 1907; цыкл «Снежная маска», 1907), часам у ёй адчуваюцца і аптыміст. ноты (цыкл «Вольныя думкі», 1908). Б. пакутліва шукаў шляхоў збліжэння інтэлігенцыі і народа (лірычная драма «Песня Лёсу», 1909), паэтызаваў гістар. мінулае Расіі (цыкл «На полі Куліковым»), праклінаў духоўнае ўбоства бурж. мяшчанства (цыклы «Скокі смерці» і «Страшэнны свет»). Рэаліст. ў сваёй аснове паэма «Адплата» (нап. 1910—21) паказвае няпавісць паэта да капіталіст. гр-ва і спадзяванні на рэвалюц. змены ў Расіі. Пасля Кастр. рэв. горача заклікаў інтэлігенцыю «ўсім сэрцам, усёй свядомасцю» слухаць «музыку рэвалюцыі» (арт. «Інтэлігенцыя і рэвалюцыя»). Рамант. паэма



«Дванаццаць» (1918) і верш «Скіфы» сцвярджаюць гістар. непазбежнасць гібелі старога свету, веліч рэвалюцыі. Творы Б. на бел. мову перакладалі А. Дудар, Р. Лынькоў, С. Дзяргай.

Тв.: Собр. соч., т. 1—8, М.—Л., 1960—63; Записные книжки, М., 1965; бел. пер. — Дванаццаць, Вільня, 1926; у кн.: Руская савецкая паэзія, Мн., 1953.

Літ.: Орлов В. Александр Блок, М., 1956; Тимофеев Л. И. Александр Блок, М., 1963; Венгров Н. Путь Александра Блока, М., 1963; Громов П. А. Блок, его предшественники и современники, М.—Л., 1966; Рубцов А. Б. Драматургия Александра Блока, Мн., 1968; Соловьев Б. Поэт и его подвиг, 2 изд., М., 1968; Машбиц-Веров И. Русский символизм и путь Александра Блока, Куйбышев, 1969; Турков А. М. Александр Блок, М., 1969; Вас І. Аляксандр Блок на Палессі, «Маладосць», 1958, № 9. *Ф. І. Куляшоў.* Мінск.

БЛОК (Bloch) Жан Рышар (25.5. 1884, Парыж — 15.3.1947), французскі пісьменнік. Чл. ФКП з 1921. Сын інжынера. Скончыўшы Сарбону, выкладаў гісторыю. Першы зб. навел «Левіі» (1912). Удзельнік 1-й сусв. вайны. Вітаў Кастр. рэв. ў Расіі, з 1919 чл. міжнар. антываеннай арг-цыі прагрэс. інтэлігенцыі «Клартэ». Найбольш значны твор раман «... і кампанія» (1917) сцвярджае гістар. асуджанасць бурж. ладу. Рэдагаваў прагрэс. перыяд. выданні. Наведаўшы Б. Усход і Афрыку, напісаў раман «Курдская ноч» (1925), дакумент. кнігі «На грузавым параходзе» (1924) і «Земляныя арэхі і бананы» (1929). У публіцыст. і літ.-крытычных працах абараняў сацыяльнае нар. мастацтва, выступаў супраць эстэтыкі бурж. дэкадансу. Пасля паездкі ў рэсп. Іспанію стварыў антыфаш. кн. «Іспанія! Іспанія!» (1936). Удзельнік Руху Супраціўлення. Жыў у СССР (1941—44). Выступленні па маскоўскім радыё сабраны ў кн. «Ад Францыі акупаванай да Францыі ўзброенай» (выд. 1949, Залаты медаль Сусв. Савета Міру 1950). Аўтар рэвалюц. п'ес «Апошні імператар» (1926), «Дантон» (1946) і антыфаш. п'есы «Тулон» (1943).

Тв.: Рус. пер.— Тулон. Избранная публицистика, М., 1949; «... и компания», М., 1957.

БЛОК КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, саюз КПСС з беспартыйнымі рабочымі, сялянамі, інтэлігенцыяй — аснова выбарчых кампаній у Вярх. Савет СССР, Вярх. Саветы саюзных і аўтаномных рэспублік і мясц. Саветы дэпутатаў працоўных. Стаў магчымы ў выніку перамогі сацыялізма ў нашай краіне. Карэнныя сац.-эканам. змены, якія адбыліся ў СССР за гады пяцігодак, прывялі да ўтварэння новага грамадскага ладу, заснаванага на дружбе народаў СССР, саюзе рабочага класа, калг. сялянства, прац. інтэлігенцыі. Камуніст. партыя — кіруючая сіла сав. гр-ва заваявала бязмежны давер працоўных. Выбарчы Б. к. і б. азначае, што кожны дэпутат-камуніст з'яўляецца дэпутатам і беспартыйных, як кожны беспартыйны дэпутат — дэпутатам і камуністаў. Выбары ў Вярх. Савет СССР 1937 паказалі адзінства партыі і народа. У галасаванні прыняло ўдзел 96,8% выбаршчыкаў, за кандыдатаў Б. к. і б. прагаласавала 98,6%. У час выбараў у Вярх. Савет СССР 8-га склікання (1970) у галасаванні ўдзельнічала 99,96% выбаршчыкаў, за кандыдатаў Б. к. і б. прагаласавала ў дэпутаты Савета Саюза 99,74%, Савета Нацыянальнасцей 99,79%. У час выбараў у Вярхоўны Савет БССР 7-га склікання (1967) у галасаванні ўдзельнічала 99,7% выбаршчыкаў, за кандыдатаў Б. к. і б. прагаласавала 99,6%.

С. Л. Саламаха. Мінск.

БЛОКААПРАЦОЎЧЫ АГРЭГАТ, паліграфічная машына для комплекснай аддзелкі кніжнага блока. Складаецца з асн. і дапаможных аперацыйных секцый: абціскальнай, кругленння, пракатвальнай, каширавальнай, папяровай, рэзальнай; мае загрузачнае прыстасаванне (саманаклад), клеевыя апараты, транспарцёры.

На паліграфічных прадпр. БССР пашыраны агрэгаты БТГ. Кніжны блок ставіцца ў гняздо гал. транспарцёра і паслядоўна апрацоўваецца ў секцыях абціскання і кругленння. З каширавальнай секцыі блок падаецца ў клеевыя апараты, марлевую і папярова-каптальную секцыі, каб наклеіць марлю, паперу, каптал (бавоўняная ці шаўковая тасьма). Канчатковая аперацыя — абціскание. На Мінскім паліграф. камбінаце імя Я. Коласа Б. а. алучаны з кнігаўставачнай машынай, што значна паскарае працэс апрацоўкі кнігі. Гл. таксама *Пераплётная вытворчасць.*

«БЛОКНОТ АГІТАТАРА», выданне аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП Беларусі. Выходзіць у Мінску з ліп. 1932; да 1947 выд. на бел. мове, з 1948 на бел. і рус. мовах, з 1963 на рус. мове. У 1943—44 выходзіў пад назвай «Блакнот агітатара-партызана» (спачатку ў Маскве, потым у Мінску). У 1947—50 былі асобныя выданні для ўсх. і зах. абласцей Беларусі. З 1966 выходзіць два разы на месяц. Разлічаны на агітатараў, палітінфарматараў; змяшчае матэрыялы для гутарак, палітінфармацый і дакладаў, пра абмен вопытам паліт. работы сярод насельніцтва, метадычныя кансультацыі і парады, адказы на пытанні чытачоў, артыкулы, падборкі лічбаў, фактаў і інш.

БЛОК-СХЕМА, 1) схема прылады, апарата, машыны, прыстасавання і г. д., дзе асобныя састаўныя вузлы (блокі) маюць выгляд прамавугольнікаў, а сувязь паміж імі паказана лініямі са стрэлкамі. 2) Б.-с. вылічальнай машыны паказвае асн. структурныя элементы і лагічныя сувязі машыны, што дазваляе прасачыць перадачу і апрацоўку інфармацыі. 3) Б.-с. праграмы — форма запісу лагічнай схемы праграмы ў вылічальнай тэхніцы. Дзеянні аператараў апісваюцца словамі ці з дапамогай формул унутры прамавугольнікаў і кружкоў. Знакі пераходу ад аператара да аператара паказваюцца стрэлкамі.

БЛОМКВІСТ Яўгенія Эдуардаўна [9(21).11.1890—27.7.1956], савецкі этнограф. Скончыла жаночы пед. ін-т (1914), этнагр. адд. Ленінградскага геагр. ін-та (1924). Д-р гістар. н. (1950). Аўтар прац па этнаграфіі народаў Паўн. Амерыкі, усх. славян, у т. л. беларусаў, манаграфіі «Сялянскія пабудовы рускіх, украінцаў і беларусаў». Удзельнічала ў складанні рус. гісторыка-этнагр. атласа, у падрыхтоўцы шматтомнай этнаграфіі народаў свету. У пасляваенныя гады ўзначальвала

ленінградскую групу славяна-рускага сектара Ін-та этнаграфіі АН СССР.

Тв.: Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов, у кн.: Восточнославянский этнографич. сборник, М., 1956. *Л. А. Малчанава.* Мінск.

БЛОНЬ, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Цітаўка. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. За 3 *км* на ПнУ ад Мар'інай Горкі (адм. ц. раёна), 64 *км* ад Мінска, 3 *км* ад чыг. ст. Пухавічы, на шашы Мінск — Бабруйск. 1590 ж., гасп. 475 (1970). Дзярж. племянны з-д «Індустрыя». Васьмігадовая школа, 2 клубы, 2 б-кі, дзіцячыя сад і яслі, фельч.-ак. пункт, сталовая, 2 магазіны. У 1902 у Б. існаваў нелегальны гурток, удзельнікі якога чыталі рэвалюц. артыкулы і пракламацыі; у 1908 адбылася дэманстрацыя сялян супраць самадзяржаўя.

БЛОХ Ісідар Рыгоравіч [18(30).9.1888, Варшава — 10.3.1958], беларускі савецкі вучоны ў галіне тарфяной прамысловасці. Чл.-кар. АН БССР (1940), праф. (1939). Скончыў Маскоўскае Вышэйшае тэхн. вуч. (1916). У 1932—41 заг. кафедры «Тарфяныя машыны» Беларускага тарфянога, потым політэхн. ін-та. Кіраўнік аддзела механізацыі Ін-та торфу АН БССР (1940—41). Нам. дырэктара па навуч. і навук. рабоце Маск. тарфянога ін-та (1941—45), заг. кафедры «Тарфяная механіка» (1941—58). Навук. працы па тэорыі, канструяванні і разліку тарфяных машын. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.



Тв.: Некоторые вопросы теории и расчета устройств, использующих цепь в качестве тягового органа, Мн., 1939; Определение удельного тягодавления колесных машин, «Торфяная промышленность», 1946, № 4.

БЛОХІ (Aphaniptera, Suctoria), атрад крывасосных насякомых. Даўж. 1—6 *мм*. Цела сплюшчанае з бакоў, укрытае хіцінавым покрывам ад бледна-жоўтага да цёмна-бурага колеру. Бяскрылыя. На выпуклай галаве пара простых вачэй. Некат. віды сляпыя. Ротавы апарат калюча-сысучы. Тры пары ног (апошняя пара самая доўгая і служыць для скачкоў). Добра перамяшчаюцца ў поўсці ці пер'і гаспадара, па зямлі скачуць. У фаўне СССР каля 1000 відаў, у БССР каля 50. Развіваюцца Б. з поўным ператварэннем (яйцо→ → лічынка → кукалка → дарослая асобіна). Лічынкі белыя, чэрвепадобныя, кормяцца арган. рэшткамі і экскрэментамі Б. Дарослыя насякомыя — вонкавыя паразіты цеплакроўных жывёл (птушак, млекакормячых) і чалавека. Некат. віды — паразіты пэўных гаспадароў, напр. сабак, катоў, грызуноў. Многія Б. — пераносчыкі ўзбуджальнікаў чумы, туляремі і інш. хвароб, прамежкавыя гаспадары некат. відаў гельмінтаў. Барацьба з Б.: гігіена жылля, апыльванне дустам ДДТ і гексахларанам нораў грызуноў.

Літ.: Высоцкая С. О. Краткий определитель блох, имеющих эпидемиологическое значение, М.—Л., 1956.

БЛОШКІ, земляныя блохі, блашкі (Halticinae), падсям. жукоў-лістаедаў. Памеры 1,5—5 *мм*. Заднія ногі скакальныя. Б. вельмі пашыраны. У СССР каля 350 відаў. Шкодзяць палявым і агародным культурам (лёну, канаплям, буракам, капусце і інш.). Вясною жукі грызуць маладыя лісточкі. Лічынкі многіх відаў кормяцца карэнямі раслін. Найлепшыя спосабы барацьбы з Б.— знішчэнне пустазелля, своечасовая сяўба, добрая апрацоўка глебы.

БЛУЖА, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». За 15 *км* на ПдУ ад Мар'інай Горкі (адм. ц. р-на), 78 *км* ад Мінска, 3 *км* ад чыг. раз'езда Блужа. 325 ж., двароў 113 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дом інвалідаў, магазін. Помнік 224 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БЛУКАЛЬНЫЯ ТОКІ, пастаянныя электрычныя токі, якія адгаліноўваюцца ад рэек электрапаязда, трамваю, руднічных электравозаў. Частку шляху праходзяць праз зямлю, абалонкі кабелю, металічныя газавыя і водаправодныя трубы. Пад уплывам Б. т. адбываецца электроліз, акісленне і карозія, што вядзе да хуткага разбурэння падземнага метал. абсталявання. Б. т. ў 1 *а* за год могуць разбурыць у найб. актыўнай зоне каля 36 *кг* свінцу ці каля 9 *кг* жалеза. На некаторых метал. збудаваннях Б. т. дасягаюць велічыні 40 *а*. Для аховы ад Б. т. выкарыстоўваюцца эл. дрэнаж, катодная ахова (падключэнне абсталявання да адмоўнага полюса выпрамніка) і інш.

БЛЮДНІЦА, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 19 *км* на ПдУ ад Буда-Кашалёва, 25 *км* ад Гомеля, 3 *км* ад чыг. ст. Уза. 243 ж., двароў 71 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка. Каля вёскі курганы перыяду Кіеўскай Русі.



БЛЮМ (Blume) Ізабела (н. 22.4.1892, г. Букагі), грамадская дзяячка Бельгіі. Па прафесіі выкладчыца гісторыі і л-ры. У 1918—51 чл. Бельгійскай сацыяліст. партыі. З 1951 член (у 1966—69 прэзідэнт-каардынатар) Сусв. Савета Міру. Чл. выканкома Бельгійскага саюзу абароны міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1953.

БЛЮМ (Blum) Леон (9.4.1872, Парыж — 30.3.1950), французскі паліт. дзеяч, лідэр Сацыяліст. партыі. У 1-ю сусв. вайну займаў шавіністычную пазіцыю. Варожа прыняў Кастр. рэвалюцыю. Выступаў супраць Кампартыі Францыі. Прыход фашыстаў да ўлады ў Германіі і ўзмацненне фаш. небяспекі

ў Францыі вымусілі Б. часова пайсці на збліжэнне з камуністамі. У 1936—38 двойчы ўзначальваў урад, які апіраўся на Народны фронт. Аднак палітыка Б. была накіравана на падрыў адзінства дэмакр. сіл і на абарону інтарэсаў буржуазіі. Ініцыятар палітыкі «неўмяшання» ў іспр. справы (1936—39). Пасля 2-й сусв. вайны адкрыта выступаў супраць сацыялізма, узначальваў урад, які распачаў калан. вайну ў В'етнаме.

Літ.: Торез М. Блюм как он есть, у яго кн.: Избр. произв., т. 1, М., 1959.

БЛЮМЕНТАЛЬ-ТАМАРЫНА (дзявочае Клімава) Марыя Міхайлаўна (16.7.1859, Пецярбург — 16.10.1938), руская савецкая актрыса. Нар. арт. СССР (1937). Прафесійн. дзейнасць пачала ў 1887. У 1901—14, 1921—32 у Маск. т-ры Корша, з 1933 у Малым т-ры. Выконвала пераважна ролі старых: Галчыха, Домна Панцялееўна, Анфуса («Без віны вінаватыя», «Таленты і паклоннікі», «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага), Матылькова («Слава» В. Гусева). З 1915 здымалася ў кіно, у т. л. ў бел. фільмах «Шукальнікі шчасця» (1936), «Дачка Радзімы» (1937). Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

БЛЮМІНГ (блуміng), металургічны стан для абціскання зліткаў. Гл. *Абціскны стан, Пракатны стан.*

БЛЮХЕР Васіль Канстанцінавіч [19.11 (1.12).1889, в. Баршчынка Рыбінскага пав. Яраслаўскай губ.— 9.11.1938), савецкі ваенны дзеяч, герой грамадзянскай вайны. Маршал Сав. Саюза (1935), першы кавалер ордэна Чырв. Сцяга (вер. 1918). З сялян. Чл. КПСС з 1916. Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1917 у Чырв. гвардыі. У 1919 камандаваў 51-й дывізіяй у баях супраць Калчака, у 1920 змагаўся за Кахоўку і Перакоп. У 1921—22 узначальваў узбр. сілы *Далёкаўсходняй рэспублікі.* Пасля грамадз. вайны камандзір 1-га корпуса, нач. Ленінградскага ўмацаванага раёна; у 1927—29 нам. камандуючага войск Украінскай ваен. акругі. З 1929 камандуючы Далёкаўсходняй арміі. На XVII з'ездзе партыі (1934) выбраны канд. у чл. ЦК ВКП(б). Узнаг. ордэнам Леніна, 5 ордэнамі Чырв. Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі.



Тв.: Статьи и речи, М., 1963.

Літ.: Душенькин В. От солдата до маршала, 3 изд., М., 1964; Кондратьев Н. Маршал Блюхер, М., 1965; Недолин И. Рейд Блюхера, Уфа, 1962.

БЛЮШЧЫК, расходнік (Glechoma), род шматгадовых травяністых раслін сямейства губакветных. Сцябло галінастае, сцелецца па зямлі, даўж. 20—80 *см*. Лісце круглява-ныркападобнае, зубчастае. Кветкі сінефіялетавыя; суквецце — кальчак. Вядома 12 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. У СССР 3, у БССР 2. Найбольш пашыраны Б. плюшчападобны (G. hederacea), нар. назвы: плюшчык, каціная мята, сабачая мята; расце на полі як пустазелле, у садах, абапал дарог, на ўзлесках. Ядавіты, мае эфірны алей, халін, дубільныя рэчывы.

БЛЯКЛЫЯ РУДЫ, група мінералаў класа сульфасоляў, якія ўтвараюць ізаморфныя сумесі. Гал. мінералы тэтраэдрыт (сурмяністая Б. р.) $Cu_{12}Sb_4S_{13}$ і тэнантыт (мыш'яковістая Б. р.) $Cu_{12}As_4S_{13}$. Маюць да 55% медзі, прымесі серабра (да 18%), ртуці, свінцу, цынку, жалеза, вісмуту і інш. элементаў. Крышталі тэтраэдрычныя кубічнай сістэмы. Колер сталёва-шэры, бляск металічны. Цв. 3—4; шчыльн. 4400—5400 *кг/м*^{3}. Крохкія. Непразрыстыя. Вельмі пашыраныя гідратэрмальныя мінералы. Самастойных скопішчаў не ўтвараюць, але ёсць ва ўсіх меднакалчаданавых і поліметалічных радовішчах. Руды на медзь.

БЛЯНДРАТА (Blandrata) Георгій (каля 1515, Салуца — каля 1588), італьянскі ўрач, антытрынітарый. Вёў прапаганду антытрынітарызму ў Жэневе, уступіў у канфлікт з Ж. Кальвінам (гл. *Кальвінізм*). У 1558 уцёк у Польшчу, стаў адным з ідэолагаў польск. і бел.-літоўскага радыкальна-рэфармац. руху. У 1562 выехаў у Сяміграддзе і адышоў ад актыўнага ўдзелу ў рэфармац. руху. У 1567 пад рэдакцыяй Б. выйшаў калектыўны твор антытрынітарыяў «Пра фальшывага і сапраўднага адзінага бога — бацьку, сына і святога духа».

Літ.: Wajsblum M. Blandrata, у кн.: Polski słownik biograficzny, t. 2, Kraków, 1936.

С. А. Падокшын. Мінск.

БОБ КАРМАВЫ, боб конскі [Vicia faba (Faba vulgaris)], аднагадовая травяністая расліна сямейства матыльковых. Сцябло прамастойнае, чатырохграннае, выш. да 2 *м*. Плод — шматнасенны струк (даўж. 5—10 *см*; 3—8 зярнят). Пераносіць кароткія замаразкі да −8 °С. Вядома каля 100 сартоў пераважна ў Еўропе і Паўн. Афрыцы. Выкарыстоўваецца на корм жывёле; насенне мае ў сярэднім 24—30% бялкоў, ядомае. Ураджай зялёнай масы 350—600, зерня 30—50 *ц/га*. У БССР пашыраны сарты: Беларускі, Рускі чорны, віндзорскія белы і зялёны.




Літ.: Кормовые бобы, М., 1962.

БОБР, рака, левы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 124 *км*. Пачынаецца на Аршанскім узв., цячэ ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл., у Крупскім, Барысаўскім, Бярэзінскім р-нах Мінскай вобл. Вадазбор (2 190 *км*^{2}) — залесеная ўзгорыстая раўніна. Шыр. даліны Б. 0,5—0,7 *км*. Шыр. рэчышча да в. Абчуга 4—6 *м*, ніжэй 20—25, каля вусця 40 *м*. Гал. прытокі злева — Асака, Пліса, Еленка, Можа, справа — Абчуга, Нача. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 14,7 *м*^{3}*/сек.*

Ніжэй упадзення Можы рака сплаўная. На Б. гар. пас. Бобр, Крупкі.

БОБР, гар. пас. (з 1941) у Крупскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Бобр». На беразе р. Бобр (прыток Бярэзіны), на шашы Мінск — Масква. За 10 *км* на У ад Крупак, 131 *км* ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Бобр. 3 тыс. ж. (1969). Лесазавод,



Бобр. Сярэдняя школа.

спіртавы з-д, участак Крупскага прамысл. камбіната. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, дзіцячы дом, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца.

У 19 ст. вёска Б. ў сувязі з ростам лясных промыслаў і лесараспрацовак стала мястэчкам. Працоўныя Б. актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. У 1905 Талачынская арг-цыя РСДРП правяла тут сход рэвалюцыйна настроеных сялян.

У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі спалілі 273 двары, загубілі 1237 жыхароў. У Б. нарадзіліся Героі Сав. Саюза М. Дз. *Конанаў* і В. А. *Князеў*. У баях за Б. загінуў Герой Сав. Саюза В. М. *Чабатароў*. На брацкай магіле помнік 147 сав. воінам і партызанам.

«БОБРУЙСКИЕ МЕДИЦИ́НСКИЕ ИЗВЕСТИЯ», медыцынскі часопіс, орган Бабруйскага павятовага аддзела аховы здароўя і камітэта прафсаюза медсанпрацы. Выдаваўся ў 1921—23 у Бабруйску па рус. мове. Асвятляў пытанні лячэбна-сан. справы, клінічнай і практ. медыцыны, прафс. жыцця. Выйшла 4 нумары.

БОБРЫК (Бобрык Верхні), рака, левы прыток Прыпяці (бас. Дняпра). Даўж. 121 *км*. Пачынаецца з водападзельных балотаў, цячэ ў Ганцавіцкім, Пінскім і па мяжы Пінскага і Лунінецкага р-наў Брэсцкай вобл. Рэльеф вадазбору (1890 *км*²) у верхняй і сярэдняй частках слабахвалісты, у ніжняй плоскі забалочаны, асабліва ніжэй воз. Пагост; лясістасць каля 50%. Шырыня далiны Б. 500—3000 *м*. Рэчышча моцна звілістае. Найб. прыток справа Вісліца. Ледастаў з пач. снежня да канца сакавіка. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 8,1 *м*³/*сек*. Б. мае меліярацыйна-лесасплаўнае значэнне.

БОБРЫК (Бобрыч), рака, левы прыток Прыпяці (бас. Дняпра). Даўж. 54 *км*. Выток на ПпУ ад воз. Чырвонае. Б. з возерам злучае канал. Цячэ ў Жыткавіцкім і Петрыкаўскім р-нах Гомельскай вобл. Вадазбор (650 *км*²) — водналедавіковая раўніна ў межах Прыпяцкага Палесся. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2,8 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры асушэнні балот.

БОБРЫК, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., на р. Бобрык Верхні (прыток Прыпяці). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Чапаева. За 60 *км* на ПнУ ад Пінска, 235 *км* ад Брэста, 27 *км* ад чыг. ст. Малькавічы, на шашы Ганцавічы — Лагішын. 698 ж., дварoў 172 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, амбулаторыя, аддз. сувязі, магазін. Каля Б., на левым беразе ракі, знойдзена паселішча эпохі неаліту і бронзы.

БОБРЫК Мікалай Іванавіч [6(19).5.1901, мяст. Глуск Магілёўскай губ.— 21.12.1956], беларускі савецкі вучоны ў галіне хірургіі, засл. ўрач БССР (1948). Канд. мед. н., дацэнт (1939). У 1926 скончыў мед. ф-т БДУ. Працаваў ардынатарам, дац. факультэцкай хірург. клінікі БДУ і Мінскага мед. ін-та (1926—41). Удзельнік Вял. Айч. вайны. Заг. кафедры агульнай хірургіі Віцебскага (1946—48) і Мінскага (1955—56) мед. ін-таў. Асн. працы па хірург. лячэнні злаякасных пухлін кішэчніка, жоўцевых перытанітаў, хвароб сляпой кішкі і чэрвепадобнага адростка. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі.

Тв.: Экспериментальные данные к патогенезу травматического шока, «Хирургия», 1939, № 6; Клиника и лечение злокачественных опухолей толстого кишечника, у кн.: Сборник научных работ Минского государственного медицинского института, т. 16, Мн., 1956.

БОБРЫК Янка [Іван Іванавіч; 8(21).7.1905, Глуск — 25.8.1942], беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1938. Сын каваля. Скончыў БДУ (1929). Настаўнічаў. У 1934 скончыў аспірантуру Акадэміі мастацтваў у Ленінградзе. Працаваў там навук. супрацоўнікам, пасля рэдактарам кінастудыі «Белдзяржкіно». Удзельнік Айч. вайны. Друкавацца пачаў у 1924. Быў чл. «Маладняка», «Прабоя». У 1926 з А. *Звонакам* і Я. *Туміловічам* выдаў аб. «Пупсовае ранне». Аўтар паэмы «Галіна» (1930) — пра жыццё вясковай інтэлігенцыі, апавяд. «У пушчы» (1927), «Андрэй Дробуш» (1932). Памёр у блакадным Ленінградзе. Пахаваны на Піскароўскіх могілках.

БОБРЫКАЎСКІ ГАРЫЗОНТ (ад назвы г. Бобрыкі, з 1961 Новамаскоўск Тульскай вобл.), адклады ніжняй часткі яснапалянскага пад'яруса візейскага яруса ніжняга карбону. Залягае на пародах турнейскага яруса або верхняга дэвону, перакрываецца тульскім гарызонтам. Вылучыў Б. М. Данышын (1941) на Пд Падмаскоўнага вуг. басейна. У разрэзе Б. г. пясчана-гліністыя пароды з прамысл. пакладамі бурага вугалю. На Беларусі вылучаны ў Прыпяцкай упадзіне В. К. Галубцовым (1956) і пацверджаны спорава-пылкovым аналізам Г. І. Кедо (1957). Складзены з кварцавых і палёвашпатава-кварцавых вуглістых пяскоў і пясчанікаў (магутнасць 0,5—437 *м*) з прапластаван-

нямі алеўралітаў і каалінавых глінаў і праслойкамі (0,05—0,1 *м*) бурага вугалю.

БОБРЫКІ, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 44 *км* на Пн ад Петрыкава, 240 *км* ад Гомеля, 33 *км* ад чыг. ст. Пціч. 547 ж., двароў 182 (1970). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, мед. пункт. У Айч. вайну вёску спалілі фашысты, загубілі 60 жыхароў. Помнік сав. воінам і партызанам. У Б. нарадзіўся Герой Сав. Саюза А. П. *Данільцкі*.

БОБРЫЦА, возера ў бас. р. Ула, левага прытока Зах. Дзвіны, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,05 *км*². Даўж. 4,5 *км*, найбольшая шыр. 1 *км*, сярэдняя 0,5 *км*. Катлавіна выцягнута з У на З. Рэльеф вадазбору (24,6 *км*²) плоска-хвалісты, марэнны. Воз. эўтрофнага тыпу. Водзяцца плотка, шчупак, акунь, лешч.

БОБСЛЕЙ (англ. bobsleigh), від спорту, скарасны спуск з гары па жолабе на спартыўных кіроўных санях. Узнік у Швейцарыі ў канцы 19 ст. Сані (таксама наз. Б.) складаюцца з дзвюх шарнірна злучаных частак: пярэдняя кіруецца рулём, задняя нерухомая.

Траса — ледзяны жолаб шыр. 1,5—2 *м* і глыб. 0,5 *м* са спец. віражамі. Сані пры спуску дасягаюць скорасці 100—130 *км/гадз*. Экіпаж 2 або 4 чал. Паводле міжнар. правілаў, маса экіпажа не павінна перавышаць 200 *кг* на Б.-двойцы і 400 *кг* на Б.-чацвёрцы. Б. пашыраны ў Польшчы, Румыніі, ГДР, ФРГ, Англіі, ЗША і інш. краінах. Уваходзіць у праграму зімовых Алімп. гульняў. Па Б. праводзяць чэмпіянаты свету, Еўропы. У СССР пашыраецца з 1968. Першыя трасы пабудаваны каля Ленінграда, у Прыбалтыцы.

БОБЫШАЎ Міхаіл Паўлавіч [7(19).11.1885, в. Пагарэлае Асташкаўскага пав. Цвярской губ.— 6.7.1964], рускі савецкі тэатральны мастак і педагог. Нар. мастак РСФСР (1961). У 1907 скончыў Вуч. тэхнічнага рысавання Штыгліца ў Пецярбургу. Праф. (1939) Ленінградскага ін-та жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна. Асн. работы ў тэатры: «Залаты пеўнік» (1923) і «Снягурачка» (1928) М. Рымскага-Корсакава, «Жоўтая кофта» Ф. Легара (1925) у Ленінградскім Малым т-ры оперы і балета, «Рыгалета» (1939) у Оперным т-ры імя Станіслаўскага, «Медны коннік» Р. Гліэра (1949) у Ленінградскім акад. т-ры оперы і балета імя Кірава і ў Вялікім т-ры СССР. У Бел. т-ры оперы і балета: «Князь Ігар» А. Барадзіна (1934), «Капелія» Л. Дэліба (1935), «Капёк-Гарбунок» Ц. Пуні (1936).

БОГ, фантастычны вобраз надпрыроднай усемагутнай істоты, якая нібыта стварыла свет і кіруе ім. Уяўленні пра Б. ўзніклі ў эпоху нераўвітай грамадскай вытворчасці і ніякага ўяроўню ведаў пра навакольны свет і падтрымліваюцца класавым прыгнётам і эксплуатацыяй. Па вызначэнні У. І. Леніна, «бог ёсць (гістарычна і жыццейска) перш за ўсё комплекс ідэй, народжаных тупой прыдаўленасцю чалавека і знешняй прыродай і класавым гнётам,— ідэй, якія замацоўваюць гэтую прыдаўленасць, усыпляюць класавую барацьбу» (Тв., т. 35, с. 94).

З стараж. часоў людзі пачалі надзяляць прыродныя з'явы, а потым і сац. сілы розумам, здольнасцю прыносіць чалавеку дабро і зло, караць і мілаваць. З завяршэннем гістарычнага працэсу фарміравання асн. монатэістычных рэлігій — *іудаізму, хрысціянства, будызму, ісламу* — Б. становіцца не толькі гал. аб'ектам рэліг. веры і культу, але і асн. паняццем ідэаліст. філасофіі. Узнікае рэліг.-філас. вучэнне пра Б.— *багаслоўе* (тэалогія). Асн. прынцыпы багаслоўя, выкладзеныя ў т. зв. «свяшчанных» кнігах (*Біблія, Каран* і г. д.), грунтуюцца на ўяўленні пра Б. як пра антрапаморфную істоту ў плоці, якая займае пэўнае месца ў прасторы і якой уласцівыя чалавечыя пачуцці. Пазней пад уплывам сац. і навук.-тэхн. прагрэсу вобраз Б. саступае месца багаслоўскай ідэі Б. як безаблічнай надпрыроднай істоты, што стварыла Сусвет і дазволіла яму развівацца паводле пэўных законаў. Сучасныя багасловы, асабліва хрысціянскія, грунтуюць доказы існавання Б. на скажоным тлумачэнні найноўшых дасягненняў навукі. Абстрагаванне сутнасці Б. тоіць у сабе немалую небяспеку для веравучэння, робіць веру ў Б. вельмі кволай і няўстойлівай. Таму хрысціянскія багасловы, імкнучыся ўплываць на пачуцці веруючых, сцвярджаюць, што «Б. ёсць любоў» (характэрна баптызму), што вера ў Б. перадае маральны сэнс чалавечага жыцця. Пад уплывам сац.-эканам. і навук.-тэхн. прагрэсу антынавуковая ідэя Б. паступова падстаўляецца беззмястоўнай. Поспехі камуніст. пераўтварэння свету вядуць да поўнага адмірання яе.

Літ.: Ленін У. І. Сацыялізм і рэлігія, Тв., т. 10 (Полн. собр. соч., т. 12); Ярославский Е. М. Как родятся, живут и умирают боги и богини, у кн.: О религии, М., 1957.

Я. М. Бабосаў. Мінск.

БОГАСТВАРАЛЬНІЦТВА, рэлігійна-філасофская плынь у Расіі, якая ставіла сабе за мэту стварыць «новую» рэлігію — без бога. Узнікла ў перыяд сталыпінскай рэакцыі сярод некат. часткі ідэйна няўстойлівай с.-д. інтэлігенцыі. Прадстаўнікі Б.— У. А. Базараў, П. С. Юшкевіч, М. У. Валянцінаў. Найбольш поўна ідэі плыні выказаны ў працах А. В. *Луначарскага* («Рэлігія і сацыялізм» і інш.). Пэўны час пад уплывам Б. быў М. Горкі, які выправіў свае памылкі даякуючы крытыцы У. І. Леніна. У адрозненне ад *богашукальніцтва*, прыхільнікі якога адкрыта заяўлялі пра сваю варожасць да марксізма, богастваральнікі імкнуліся аб'яднаць рэлігію з марксізмам, надаць навук. сацыялізму характар рэліг. веравання, замяніць матэрыялізм *махізмам*. Яны прынялі ўдзел у стварэнні групы «Наперад», якую ўзначальваў А. *Багданаў*. У чэрв. 1909 нарада расшыранай рэдакцыі «Пролетария» асудзіла фракцыйную дзейнасць богастваральнікаў, якія адстойвалі тактыку адзавістаў і ультыматыстаў. Рэвалюц. ўздым, што пачаўся ў 1910—12, прывёў Б. да поўнага ідэйнага краху.

Літ.: Ленін У. І. Пісьмо А. М. Горкаму. 25.2.1908, Тв., т. 13 (Полн. собр. соч., т. 47); Его ж. Нарада расшыранай рэдакцыі «Пролетария», Тв., т. 15 (Полн. собр. соч., т. 19); Ласкова я М. П. Борьба В. И. Ленина против богоискателей и богостроителей и ее значение для разоблачения современных религиозных течений, М., 1968.

З. П. Кузьмічэнка. Мінск.

БОГАШУКАЛЬНІЦТВА, рэлігійна-філасофская плынь, якая адлюстроўвала імкненне рускай контррэвалюцыйнай буржуазіі «ажывіць рэлігію, узняць попыт на рэлігію, выдумаць рэлігію, прывіць народу ці па-новаму ўмацаваць у народзе рэлігію» (Ленін У. І. Тв., т. 16, с. 30). Узнікла ў Расіі

ў пач. 20 ст. і распаўсюдзілася пасля паражэння рэвалюцыі 1905—07 сярод дваранскай і бурж. інтэлігенцыі.

Прадстаўнікі Б.— М. Бярдзяеў, С. Булгакаў, Дз. Мережкоўскі, З. Гіпіус, М. Мінскі, А. Белы і інш.— групаваліся вакол пецярбургскага Рэлігійна-філасофскага т-ва. Выдавалі час. «Новый путь» і «Вопросы жизни» ў Пецярбурзе, а таксама «Весы» і «Перевал» у Маскве. Былі цесна звязаны з рэакц. літ. плынямі — дэкадэнцтвам і сімвалізмам.

Багашукальнікі абвяшчалі марксізм скажонай рэлігіяй, якую трэба замяніць «новым хрысціянствам», разглядалі гісторыю чалавецтва як гісторыю змены рэлігій. Пасля Кастр. рэв. Б. знікла.

Літ.: Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); яго ж. Аб адносінах рабочай партыі да рэлігіі, Тв., т. 15 (Полн. собр. соч., т. 17).

БОГДАН Алена Іванаўна (н. 5.5.1931, в. Лабна-Агароднікі Аўгустоўскага пав. Беластоцкага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1965. У 1949—57 работніца Гродзенскага піўзавода, з 1957 свінарка саўгаса «Пагранічнік» Гродзенскага р-на. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл.

БОГІНА, вёска ў Далёцкім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на зах. і ўсх. берагах воз. *Богінскае*. Цэнтр калгаса імя Мічурына. За 35 *км* на ПдЗ ад Браслава, 273 *км* ад Віцебска, 33 *км* ад чыг. ст. Дукштас (Літ. ССР). 294 ж., двароў 101 (1970). Пільня, лясніцтва. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. У 1915 вёску спалілі кайзераўскія войскі. У Вял. Айч. вайну Б.— месца дыслакацыі партыз. брыгады «Спартак».

БОГІНСКАЕ, возера ў бас. р. Дрысвята, левага прытока Дзісны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 15 *км*². Даўж. 11,8 *км*, сярэдняя шыр. 1,27 *км*, найб. глыбіня 14 *м* (на ПнЗ), сярэдняя 5,2 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. На воз. 10 а-воў. Пераважаюць спадзістыя схілы, паўн.-ўсходнія выкарыстоўваюцца пад ворыва, паўд.-ўсходнія — аблесеныя. Дно ўслана крамяняёмістымі аліўкавымі сапрапелямі. У залівах сапрапель грубадэтрытавы. Вадазбор (929 *км*²) дробна- і сярэднеўзгорысты на Пн, нізінны на Пд, складзены з суглінкаў і супескаў. Возера зарастае. Шыр. палосы трыснягу і чароту 50—80 *м*. У залівах растуць рдесты і гарлачыкі. Праз возера працякае р. Дрысвята. З У і ПнУ ўпадаюць ручай Чарніца і р. Янка. На Пн Б. вузкім перашыйкам аддзелена ад воз. Высокае. Водзяцца плотка, шчупак, лешч, судак, верхаводка, вугор і інш. На паўд.-ўсх. беразе штучныя сажалкі для сяголетак карпа.

В. П. Якушка. Мінск.

БОГУШ-СЕСТРАНЦЭВІЧ Станіслаў Станіслававіч (1869, Вільня — 1927), графік і жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай акад. мастацтваў (1889—94). Шмат падарожнічаў па Беларусі і Літве. У сваіх жанравых творах адлюстраваў побыт бел. і літ. сялян і гараджан, высмейваў норавы мяшчан. Аўтар іл. да апавядання Э. Ажэшкі «Гэдалі» (1907),



С. С. Богуш-Сестранцэвіч. Праца ў фальварку. Дзяржаўны мастацкі музей Літоўскай ССР. Вільнюс.

графічных лістоў «У мястэчку», «Злоўлены жывым», «Праца ў фальварку», «Цыганы» і інш., анімалістычных малюнкаў («Стаенік», «Бегавы конь»), а таксама карцін («Баль у Мінску», «Прачкі»). Удзельнік выставак: Пецярбургскага т-ва мастакоў (1890—1900), мастацкай у Мінску (1911).

БОГХЕД (англ. boghead, ад назвы мястэчка ў Шатландыі), разнавіднасць выкапнёвых сапрапелевых вугалёў, утвораных з сіне-зялёных водарасцей. Колер Б. ад аліўкавага да чорна-бурага. Шчыльны, неслаісты. Злом ракавісты. Паверхня на зломе матавая. Змяшчае вадароду 8—12%, лятучых рэчываў 75—90%; выхад першаснага дзёгцю да 50%. Цеплатворная здольнасць 4900—9000 *ккал/кг*. Трапляецца лінзамі і праслоямі ў Падмаскоўным басейне. Б.— каштоўная сыравіна хім. прамысл., ідзе на выраб штучнага вадкага паліва, змазачных рэчываў.

БОГША Лазар (г. н. і см. невяд.), полацкі майстар-ювелір 12 ст. Свабодны рамеснік. У 1161 зрабіў князёўне Ефрасінні шасціканцовы напрастольны крыж. Крыж Ефрасінні Полацкай — выдатны твор старарус. мастацтва, абкладзены 21 залатой пласцінай з эмалевымі выявамі святых і арнаментам (спераду) і 20 сярэбранымі пласцінамі з надпісам (па баках), упрыгожаны каштоўнымі камянямі і жэмчугам. Крыж у 1941 зберагаўся ў Магілёве. Вывезены ням.-фаш. грабежнікамі.



Л. Богша. Крыж Ефрасінні Полацкай. 1161.

Літ.: Алексеев Л. В. Лазарь Богша — мастер-ювелир XII в., «Советская археология», 1957, № 3.

М. С. Кацар. Мінск.

БОДРЫЧЫ, абадрыты, племя палабскіх славян на ўзбярэжжы Балтыйскага мора ў ніжнім цячэнні р. Лабы (Эльбы).

З 8 ст., як паведамляюць хронікі, узначальвалі саюз плямёнаў, у які, акрамя Б., уваходзілі вагры, палабы і інш. Займаліся земляробствам, рыбалоўствам, рамёствамі. Вялікія гарады (Велеград, Старград і інш.) гандлявалі з Руссю, Германіяй, Скандынавіяй. У 8—9 ст. у саюзе з франкамі валявалі супраць саксаў і датчан. З 10 ст., пасля распаду імперыі Каралінгаў, вялі сістэматычную барацьбу супраць герм. феадалаў. У 11 ст. Б. узначалілі вялікае аб'яднанне суседніх слав. плямёнаў — Вендскую дзяржаву, якая існавала амаль стагоддзе. У 2-й пал. 12 ст. Б. завалваны ням. феадаламі, пазней анямечаны.

Літ.: Грацианский Н. П. Борьба славян и народов Прибалтики с немецкой агрессией в средние века, М., 1943.

БОЖЫЧ, адзін з багоў язычніцкай міфалогіі паўднёвых славян, сын вярхоўнага бога — «творцы бліскавіцы». Быў увасабленнем сонца, нібыта штогод паміраў і нараджаўся зноў. Культ Б. зрабіў уплыў на ўяўленні славян пра хрысціянскага Ісуса. Свята «нараджэння Хрыстовага» сербы, харваты, славенцы называюць «Божычам», балгары — «Божыкам».

БОЖЫЯ КАРОЎКІ, какцынеліды (Coccinellidae), сям. жукоў. Даўж. звычайна 4—7 *мм*. Цела авальнае, пукатае, яркае, «перасцерагальнага» колеру. Каля 3000 відаў, у СССР каля 160. Жукі і лічынкі Б. к. пераважна драпежнікі: кормяцца тлёю, радзей чарвякамі і кляшчамі. Некат. выкарыстоўваюцца ў барацьбе са шкоднымі насякомымі, некат. самі шкодзяць раслінам, напр. бахчавая Б. к. (Epilachna chrysomelina). Большасць Б. к. карысныя.



Сямікрапінкавая кароўка.

БОП (ваен.), арганізаваная ўзброеная сутычка падраздзяленняў, часцей і злучэнняў сухапутных, паветраных ці марскіх сіл варожых бакоў. Мае на мэце дабіцца перамогі знішчэннем праціўніка ці нанясеннем яму такога паражэння, якое прымусіла б яго адмовіцца ад выканання пастаўленай задачы. Можа адбывацца на зямлі, у паветры і на моры. Наземны Б., у якім удзельнічаюць усе роды сухап. войск пры падтрымцы авіяцыі (іншы раз і ВМФ), наз. агульнавайсковым.

Сучасны агульнавайсковы Б. характарызуецца шырокім выкарыстаннем найноўшай зброі і разнастайнай тэхнікі, высокай манеўранасцю, хуткімі і рэзкімі зменамі становішча, вялікім прасторавым размахам; магчыма ўжыванне ядзернай зброі і інш. сродкаў масавага паражэння. У залежнасці ад мэты і спосабу яе дасягнення адрозніваюць: наступленне, сустрэчны бой, абарону і адыход. Найважнейшыя прынцыпы сучаснага агульнавайсковага Б.: раптоўнасць нападу, актыўнасць і бесперапыннасць баявых дзеянняў, маніраванне сродкаў па напрамку гал. удару, разгрупаванне сіл, узаемадзеянне родаў войск і інш.


А. К. Кузуб. Мінск.

БОП-ЖАЛЕНСКІ (Żeleński; псеўд. Boy) Тадэвуш (21.12.1874, Варшава — 4.7.1941), польскі пісьменнік, публіцыст, перакладчык і крытык. Сын кампазітара. Урач па адукацыі. Пачаў літ. дзейнасць з сатыр. куплетаў (кн. «Слоўцы», 1913), у якіх высмейваў дэкадэнцтва і мяшчанскае эстэцтва. Напісаў успаміны «Ці знаеш край?» (1930—31), «Жывыя людзі» (1929). Пераклады Б.-Ж. франц. класікаў (Ф. Рабле, Ж. Б. Мальер, Вальтэр, А. Бальзак і інш.) склалі каля 100 тамоў т. зв. «Бібліятэкі Боя». Матэрыяліст. погляды выказаў у публіцыст. артыкулах (аб. «Кансісторскія нявінніцы», 1929; «Пекла жанчын», 1930; «Нашы акупанты», 1932). Гістор.-літ. працы Б.-Ж. пра А. Міцкевіча, А. Фрэдру, Н. Жміхоўскую накіраваны супраць бурж.-ідэаліст. літ.-знаўства. У 1939—41 праф. Львоўскага ун-та. Расстраляны гітлераўцамі.

Тв.: Pisma, t. 1—25, Warszawa, 1956—68.

Літ.: Stawar A. Tadeusz Żeleński (Boy), Warszawa, 1958; Winklowa B. Tadeusz Żeleński (Boy). Twórczość i życie, Warszawa, 1967.

БОПКА, пасудзіна для збівання масла ў хатніх умовах. Мае форму звужанай зверху бочачкі; драўляныя клёпкі змацаваны абручамі, дно ўстаўное, накрыўка з адтулінай для калатоўкі (біла). Да канца калатоўкі прымацаваны перакрыжаваныя планачкі або кружок з дзіркамі.



БОЙКА Барыс Барысавіч (н. 6.8.1923, в. Ходараўка Горацкага пав. Смаленскай губ.), беларускі савецкі фізік. Чл.-кар. АН БССР (1969), д-р фіз.-матэм. н. (1965). Чл. КПСС з 1964. Скончыў БДУ (1951). Працаваў у Фіз.-тэхн. ін-це АН БССР. З 1958 у Ін-це фізікі АН БССР, заг. лабараторыі аптычнай электронікі (з 1968). Даследаванні ў галіне вымушанай аптычнай анізатропіі і квантавай электронікі. Распрацаваў тэарэт. і эксперымент. асновы палярызацыйна-аптычнага метаду вывучэння працэсаў цячэння вязкіх асяроддзяў. Стварыў арыгінальную прыладу для даследавання вымушанай аптычнай анізатропіі. Вынайшаў новы тып рэзанатара для аптычных квантавых генератараў.



Тв.: (Разам з С. І. Губкіным і С. І. Дабравольскім) Фотопластичность, Мн., 1957; (разам з М. С. Пятровым, В. В. Валяўкам і І. М. Вашкевічам) Лазерное устройство с двумерным резонатором, «Журнал прикладной спектроскопии», Мн., 1968, т. 8, в. 2.

Літ.: Тамільчык Л. Адразу ступень доктара, «Маладосць», 1963, № 9.

БОПКА Юрый Рыгоравіч (н. 6.3.1925, Саратаў), беларускі савецкі патолагаанатам. Д-р мед. н. (1964), праф. (1965). Чл. КПСС з 1954. У 1948 скончыў Тбіліскі мед. ін-т. У 1956—61 асістэнт кафедры паталагічнай анатоміі 1-га Ленінградскага мед. ін-та. З 1961 заг. кафедры паталагічнай анатоміі Гродзенскага мед. ін-та. Асн. працы па паталагічнай анатоміі надстраўнікавай залозы і ролі сасудзістых расстройстваў, калі ўзнікае вострае яе запаленне.

Тв.: Трупная имбибиция и кровоизлияния в поджелудочную железу, у кн.: Сборник научных работ сотрудников кафедры и судебных медиков Государственного ордена Ленина ин-та усовершенствования врачей им. С. М. Кирова, в. 18, Л., 1959; Об опухолях вилочковой железы, «Архив патологии», 1969, № 1.

БОПЛЕР (англ. boiler кацёл, кіпяцільнік), тое, што і *водападагравальнік*.

БОПНАЯ (Буйная), рака, правы прыток Нёмана. Даўж. 27 *км*. Цячэ па Нёманскай нізіне, у Стаўбцоўскім р-не Мінскай і Навагрудскім р-не Гродзенскай абл. Злучана каналам з р. Чорнай, якая ўпадае ў Нёман вышэй. Вадазбор (78 *км*²) нізінны: водналедавіковая нізіна ў вярхоўі, азёрна-ледавіковая і азёрна-балотная ніжэй па цячэнні. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,5 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры асушэнні балотаў.

БОП-СКАЎТЫЗМ, гл. *Скаўтызм*.

БОКІЙ Глеб Іванавіч [парт. псеўд. Кузьма, Дзядзька, Максім Іванавіч; 21.6(3.7).1879, Тыфліс — 8.9.1940], прафесійны рэвалюцыянер, савецкі парт. і дзярж. дзеяч. З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1900. Удзельнічаў у рабоце Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа», у рэвалюцыі 1905—07. Быў пад арыштам і ў ссылках. У 1916 уведзены ў Рускае бюро ЦК РСДРП(б). З крас. 1917 да сак. 1918 сакратар Петраградскага к-та РСДРП(б). Чл. ВРК, старшыня Петраградскай надзвычайнай камісіі. У ліст.— снеж. 1918 узначальваў камісію ЦК РКП(б), якая правярала дзейнасць Мінскага падпольнага к-та партыі, удзельнічаў у аднаўленні работы Мінскага Савета (3.12.1918). З 1919 нач. асобага аддзела Туркестанскага фронту, чл. Туркестанскай камісіі ВЦВК і ЦК РКП(б). З 1921 на адказных пасадах ва Усерасійскай надзвычайнай камісіі (ВЧК), чл. калегіі АДПУ, НКУС. Чл. ЦВК СССР 1-га і 2-га скл.

Літ.: Брычкина В. Бокий Глеб Иванович, у кн.: Герои Октября, т. 1, Л., 1967.

У. К. Коршук. Мінск.

БОКЛЬ (Buckle) Генры Томас (24.11.1821—29.5.1862), англійскі гісторык і сацыёлаг-пазітывіст, прадстаўнік геагр. дэтэрмінізму. Крытыкаваў тэалагічную трактоўку гісторыі. Гал. фактарам гістар. развіцця лічыў разумовы прагрэс. Асаблівасці гістар. развіцця розных народаў тлумачыў уплывам геагр. асяроддзя, асабліва ландшафту.

Тв.: Этюды, СПб., 1867.

БОКС (англ. box літар. ўдар), від спорту, адзінаборства ў кулачным баі паводле пэўных правілаў. Баксіруюць у скураных пальчатках масай 300 *г* (у прафесійным Б. да 200 *г*) на рынгу памерам звычайна (*м*) 5×5, абнесеным канатам. Забараняюцца захопы, штуршкі, падножкі, удары ніжэй пояса, па патыліцы, у спіну, галавой, адкрытай пальчаткай. Звычайна бой праходзіць у 3 раўнды па 3 *мін* з перапынкамі па 1 *мін* (у прафесійным Б. да 15 раўндаў). Баксёр перамагае накаўтам, калі яго праціўнік пасля ўдару не можа весці бою пасля таго, як суддзя на рынгу адлічыць 10 *сек*. Перамога з яўнай перавагай прысуджаецца таму, хто тры разы збіў праціўніка з ног (накдаўн), а таксама пры яўнай тэхн. перавазе аднаго баксёра над другім. Па ачках выйграе баксёр, якому суддзі залічаць больш правільных удараў і абаронных дзеянняў, а пры аднолькавай колькасці ачкоў — вышэй ацэняць тэхніка-тактычнае майстэрства. Баксёраў адрозніваюць па узроставых, разрадных і вагавых групах.

Б. развіўся з кулачнага бою. У Ст. Грэцыі кулачны бой быў у праграме Алімп. гульняў. Біліся «сценка на сценку» і «адзін на адзін» і ў Кіеўскай Русі. Упершыню правілы Б. ў пальчатках уведзены ў Англіі (1867), якая культывавала прафесійны («прызавы») Б. У Расіі развіваўся аматарскі Б. Пасля ўстанаўлення Сав. улады Б. стаў сродкам фіз. выхавання моладзі ў ваенна-спарт. клубах Усенавуча, спарт. т-вах і ведамствах. Сав. баксёры — удзельнікі Алімп. гульняў (з 1952), чэмпіянатаў Еўропы (з 1953) і інш. міжнар. спаборніцтваў спартсменаў-аматараў.

У БССР Б. пачаў развівацца з 1928. Па ініцыятыве У. А. Лебедзева ў г. Барысаве (1928) створана секцыя Б. Сярод чэмпіёнаў СССР спартсмены БССР: У. Коган (1949, у тым жа годзе заняў 3-е месца на маладзёжным фестывалі ў Будапешце), У. Бацвіннік (1959), А. Засухін (1961 і 2-е месца па першынстве Еўропы). Спецыялісты па Б. ў БССР: засл. трэнер СССР У. Коган і засл. трэнеры БССР А. Брын, І. Новікаў, Л. Раманенка, П. Сомаў (Мінск), Л. Аксельрод (Бабруйск), Я. Кулінковіч, І. Рубін (Гродна), У. Уласаў (Брэст), П. Хімакоў (Гомель). Займаецца Б. (1970) больш як 6 тыс. чалавек, з іх больш як 100 — майстры спорту СССР.

Літ.: Градополов К. В. Бокс, 4 изд., М., 1965; Огуренков Е. П. Современный бокс, М., 1966; Степанов В. Г. Судейство соревнований по боксу, М., 1962.

Б. А. Шчарбакоў. Мінск.

БОЛАТАЎ Андрэй Цімафеевіч [7(18).10.1738, с. Дваранінава Алексінскага пав. Тульскай губ. — 4(16).10.1833], рускі вучоны і пісьменнік, адзін з заснавальнікаў рускай аграномічнай навукі. Вывучаў узаемасувязь раслінаводства і жывёлагадоўлі, спосабы развядзення пладовых дрэў. Прапанаваў замену трохпольнага севазвароту шматпольным з увядзеннем травасеяння. Выявіў *дыхагамію* ў раслін; паказаў перавагу перакрыкаванага апылення; класіфікаваў пустазелле, распрацаваў меры барацьбы з ім. Упершыню выказаў ідэю гібрыдызацыйна-селекцыйнага метаду. З літ. твораў Б. найб. вядомы аўтабіягр. запіскі, у якіх ёсць звесткі для вывучэння сац. ўкладу і побыту Расіі 2-й пал. 18 ст., матэрыял пра сялян. вайну 1773—75. У запісках Б. трымаўся прыгонніцкіх поглядаў.

Тв.: Избранные сочинения по агрономии, плодоводству, лесоводству, ботанике, М., 1952; Жизнь и приключения Андрея Болотова, описанные самим им для своих потомков. 1738—1793, т. 1—3, М.—Л., 1931.

Літ.: Бердышев А. П. Андрей Тимофеевич Болотов — первый русский ученый агроном, М., 1949; Блок А. А., Болотов и Новиков, Собр. соч., т. 11, Л., [1934].

БОЛБАС Аляксандр Карпавіч [н. 28.11(11.12).1911, в. Слабодка Бабруйскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Мінскую саўпартшколу (1937), Мінскі камвуз (1939). У Чырв. Арміі з 1939. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. На фронце з 22.6.1941. Удзельнік абароны Мінска, Бабруйска, Рагачова, Магілёва, Смаленска, Масквы, бітвы на Курскай дузе, вызвалення Данбаса, Кіева, Вільнюса, Рыгі. Вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Кіева. Калі камандзір батальёна быў паранены, камандаванне прыняў капітан Б. На лодках і падручных сродках батальён фарсіраваў Дняпро і перайшоў у атаку. 4 сутак батальён утрымліваў плацдарм. Жыве ў Кіеве.



БОЛДЗІН Аляксандр Міхайлавіч [8(20).11.1892, Сімбірск — 27.9.1963], беларускі савецкі вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1947), праф. (1948). У 1916 скончыў мед. ф-т Казанскага ун-та. У 1917—22 урач у Чырв. Арміі. У 1945—49 заг. кафедры аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі Кішынёўскага мед. ін-та, 1949—50 заг. кафедры факультэтскай хірургіі мед. ф-та Мангольскага дзярж. ун-та імя Чайбалсана. У 1950—63 заг. кафедры хірургіі Бел. дзярж. ін-та ўдасканалення ўрачоў. Асн. працы па хірургіі страўнікава-кішачнага тракту і жоўцевых шляхоў. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: К технике атипичных резекций желудка, «Здравоохранение Белоруссии», 1957, № 4; (разам з У. М. Грышкевічам) К вопросу об этиологии и патогенезе острого аппендицита, там жа, 1960, № 7; (разам з А. А. Плавінскім) Наркоз в стадии анальгезии, там жа, 1961, № 4.

БОЛДЗІН Іван Васілевіч [3(15).8.1892, в. Высокае Інсарскага пав. Пензенскай губ. — 28.3.1965], сав. ваенны дзеяч, удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Ген.-палк. (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1918. У Чырв. Арміі з 1919. Скончыў Акадэмію імя Фрунзе (1926). Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). З вер. 1940 першы нам. камандуючага Асобай Зах. ваен. акругі. У Айч. вайну ваяваў пад Масквой, на Курскай дузе. У час вызвалення Беларусі камандуючы 50-й арміі, войскі якой фарсіравалі Проню, Дняпро, Бярэзіну, вызвалілі Чавусы, Магілёў; удзельнічалі ў ліквідацыі *мінскага «катла»*, вызваленні Гродна, Польшчы, у баях ва Усх. Прусіі. Пасля вайны Б. камандуючы войск Усх.-Сібірскай ваен. акругі, з 1953 нам. камандуючага і чл. Ваен. савета Кіеўскай ваен. акругі, з 1958 у Мін-ве абароны СССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі.

БОЛКАЛЫ, вёска ў Шкуцікаўскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл., на р. Дзісна. Цэнтр калгаса імя Ільіча. За 7 *км* на ПнУ ад Шаркоўшчыны, 203 *км* ад Віцебска, на шашы Шаркоўшчына — в. Германавічы. 197 ж., двароў 74 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт.

БОЛНЫРА (Болнара), возера ў бас. р. Обаль, правага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,7 *км*². Даўж. 2 *км*, найбольшая шыр. 2 *км*, сярэдняя 1,3 *км*. Катлавіна чашападобная. Рэльеф вадазбору (77,2 *км*²) узгорысты, марэнны. Праз возера працякае р. Дражбітка. Невялікі сцёк з возера ў р. Свіна. Водзяцца шчупак, лешч, акунь, плотка.

БОЛЬ, пакутнае адчуванне ад моцных вонкавых або ўнутраных уздзеянняў на жывыя тканкі. Прыкметы Б.: своеасаблівая міміка, слёзы, расшыраныя зрэнкі, крык, стогны, зменены артэрыяльны ціск, парушаны сардэчна-сасудзістая дзейнасць, дыханне. Адрозніваюць Б. мясцовы — непасрэдна ў паражоным органе і адлюстраваны (праекцыйны) — у пэўных зонах скуры. Ведаючы гэтыя зоны, можна распазнаваць па іх хваробы сэрца, страўніка, печані, нырак. Бывае павышаная адчувальнасць да Б. і паніжаная, а часам поўная адсутнасць яе — анальгезія, што бывае пры некат. нервовых (сірынгаміэлія) і псіхічных (істэрыя) хваробах. Гл. таксама *Абязбольванне*.

Літ.: Дионесов С. М. Боль и ее влияние на организм человека и животных, 2 изд., М., 1963; Кассиль Г. Н. Боль и обезболивание, 2 изд., М., 1965.

Д. М. Кулак. Мінск.

БОЛЬЦІШКІ, вёска ў Пашкавіцкім с/с Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 45 *км* на ПдЗ ад Воранава, 115 *км* ад Гродна, 25 *км* ад чыг. ст. Ліда. 252 ж., двароў 61 (1970). Клуб, б-ка, урачэбны ўчастак, магазін, майстэрня быт. паслуг.

БОЛЬЦМАН (Boltzmann) Людвіг (20.2.1844, Вена — 6.9.1906), аўстрыйскі фізік. Чл. Венскай АН (1885). Праф. ун-таў у Грацы, Мюнхене, Вене, Лейпцызе. Асн. навук. працы па тэрмадынаміцы і стат. фізіцы (гл. *Больцмана статыстыка*). Вывеў асноўнае ўраўненне кінетычнай тэорыі газаў, даў стат. тлумачэнне 2-га закону тэрмадынамікі і энтрапіі, абгрунтаваў закон цеплавога выпрамянення Стэфана (закон Стэфана — Больцмана). У барацьбе з Э. Махам і В. Ф. Оствальдам адстойваў матэрыялістычныя погляды. Скончыў самагубствам.



Тв.: Рус. пер.— Лекции по теории газов, М., 1956 (ёсць біягр. В.).

Літ.: Брода Э. Людвиг Больцман, «Вопросы истории естествознания и техники», 1957, в. 4.

БОЛЬЦМАНА СТАТЫСТЫКА, раздзел статыстычнай фізікі, які вывучае ўласцівасці сістэм неўзаемадзейных часцінак (электронаў, атамаў, малекул), што рухаюцца паводле законаў класічнай механікі.


Распрацавана ў 2-й пал. 19 ст. Дж. К. *Максвелам* і Л. *Больцманам*. Б. с. апісвае стан ідэальнага газу функцыяй размеркавання $f(p_x, p_y, p_z; x, y, z; t)$, якая мае той сэнс што выраз $dN = f d\,p_x\,dp_y\,dp_z \times dx\,dy\,dz$ дае сярэдні лік часцінак у момант часу t у аб'ёме $dV = dx\,dy\,dz$ каля пункта (x, y, z) з кампанентамі імпульсу паміж p_x, $p_x + dp_x$; p_y, $p_y + dp_y$; p_z, $p_z + dp_z$. Ва ўмовах цеплавой раўнавагі функцыя f не залежыць ні ад часу t для адналатамнага газу, на які дзейнічаюць знешнія сілы $f = C \exp(-E/kT)$, дзе C залежыць ад шчыльнасці газу, масы часцінак і абс. т-ры T, $k = 1{,}38 \times 10^{-23}$ *дж/град* — пасталянная Больцмана, E — поўная энергія часцінкі. Функцыя f наз. размеркаваннем Максвела — Больцмана, якое можна пашырыць і на шмататамныя газы. Вынікам яго з'яўляецца закон раўнамернага размеркавання кінетычнай энергіі па ступенях свабоды малекул: на кожную ступень свабоды прыпадае ў сярэднім энергія $\frac{1}{2}kT$. Б. с. карыстаюцца ў тых выпадках, калі квантавыя эфекты ў руху часцінак можна не ўлічваць. Крытэрый *пе дастасавальнасці* $(2\pi mkT)^{3/2}/nh^3 > 1$, дзе m — маса часцінкі, n — шчыльнасць ліку часцінак, h — *Планка пасталянная*. Гэты крытэрый практычна заўсёды выконваецца для звычайных газаў і электронаў праводнасці ў паўправадніках. З квантавай механікі вынікае, што для мікрачасцінак Б. с. недакладная і заменьваецца статыстыкай Базэ — Эйнштэйна або Фермі — Дзірака (гл. *Квантавая статыстыка*).

Б. с. шырока карыстаюцца ў розных галінах фізікі: кінетычнай тэорыі газаў, фізіцы паўправаднікоў, фізіцы плазмы, тэорыі эл. і магн. з'яў у рэчыве і інш.

Літ.: Ландау Л. Д. и Лифшиц Е. М. Статистическая физика, 2 изд., М., 1964 (Теоретич. физика, т. 5).


В. І. Кузьміч. Мінск.

БОМБА (італьян. bomba ад лац. bombus шум), 1) артылерыйскі снарад гладкаствольнай артылерыі. Рабілася Б. з чыгуну ў форме шара. Усярэдзіне зарад з дымавога пораху. Выбух выклікаўся агнём запальнай трубкі. З 19 ст. Б.— артыл. канічны снарад цяжэйшы за 16 *кг*. 2) Адзін з відаў боепрыпасаў авіяц. самалётаў, суднаў. Прызначаецца для паражэння наземных, надводных і падводных цэляў. Маса ад 0,5 *кг* да 10 *т* і больш, даўж. да 5 *м* і больш. Падзяляюцца на фугасныя, глыбінныя, бранябойныя, асколачныя (у т. л. шарыкавыя), хімічныя (напалмавыя), біялагічныя, дымавыя, запальныя (тэрмітныя), асвятляльныя, агітацыйныя і Б. з ядз. зарадам (гл. *Атамная бомба, Вадародная бомба*). 3) Сасуд спец. канструкцыі (металічны цыліндр з масіўным дном і накрыўкай) для вызначэння цеплаўтваральнай здольнасці паліва — каларыметрычная Б. Наважка паліва знаходзіцца ў кварцавай чашы. Цыліндр, з якога выдалена паветра, запаўняецца кіслародам да ціску 25 *ат*. Ад напальвання жалезнага дроту эл. токам паліва згарае. Колькасць цяпла вызначаецца павышэннем т-ры вадзянога каларыметра, у якім знаходзіцца Б. 4) Цыліндрычны масіўны сасуд з свінцу для вызначэння разбуральнай здольнасці выбуховых рэчываў (свінцовая Б.). Разбуральнае дзеянне вызначаецца павелічэннем аб'ёму Б. ад выбуху пэўнай колькасці рэчыва. 5) Прылада для вывучэння законаў утварэння газаў пры гарэнні пораху ў пазменным аб'ёме (манаметрычная Б.).



Авіяцыйная бомба:
1 — апярэнне; *2* — донны ўзрывальнік; *3* — зарад выбуховага рэчыва; *4* — корпус; *5* — галаўны ўзрывальнік.

БОН (Bonn), сталіца ФРГ, на левым беразе Рэйна. Чыг. вузел, аэрапорт, рачны порт. 138,2 тыс. ж. (1967). У горадзе і каля яго прадпрыемствы эл.-тэхн., металаапр. (каляровыя металы), керамічнай, хімічнай (у т.л. фармацэўтычнай), палігр. прамысловасці. Выраб канцылярскіх тавараў, мэблі. Паблізу горада здабыча бурага вугалю.



Бон. Кобленцэрштрасэ.

Засн. рымлянамі ў 1 ст. З 1267 да 1794 рэзідэнцыя кёльнскіх курфюрстаў. У 1794 акупаваны франц. войскамі, пасля паражэння Напалеона перададзены Прусіі. У Бонскім ун-це ў 1835—36 вучыўся К. Маркс. У Б. нарадзіўся і вырас Л. Бетховен. Стары горад з рэштках рымскага лагера Бона мяжуе з новым. Раён, дзе багатыя вілы, з 1949 заняты дзярж. ўстановамі. Помнікі архітэктуры: раманскі сабор (11—13 ст.); гатычны каперл мінарытаў (1274—1317); барочны каперл езуітаў (1686—1717), замак курфюрста (1697—1723, арх. Э. Цукалі і Р. дэ Кот), ратуша (1737—38). Музей Бетховена (у доме, дзе ён нарадзіўся). Акадэмічны маст. музей («Анатомія», 1822—24, арх. К. Ф. Шынкель). Ун-т (з 1777), пед. ін-т, вышэйшая с.-г. школа, кансерваторыя.

БОНА (Bona Sforza; 2.2.1494, Вігевана, Італія — 19.11.1557), каралева Рэчы Паспалітай, жонка вялікага князя Вял. кн. Літоўскага і караля Польшчы *Жыгімонта I* Старога (з 1518), маці *Жыгімонта II* Аўгуста. Імкнулася ўзмацніць уладу вял. князя і караля ўмацаваннем іх эканам. магутнасці. Выкупляла дзярж. землі, што былі ў заставе, набывала маёнткі прыватных уласнікаў. У выніку судовых працэсаў вярнула ў вялікакняскі дамен многія захопленыя магнатамі дзярж. землі. На Беларусі сканцэнтравала ў сваіх руках Гродзенскае, Давыд-Гарадоцкае, Клецкае, Кобрынскае і Пінскае старостваў; Аболецкую, Езярышчанскую, Рагачоўскую і Усвяцкую вол.; Дабучын (Пружаны), Зэльву, Крэва, Мсцібаву, Сялец, Цяцерын, Шарашова і інш. маёнткі. Каб павялічыць прыбыткі і ўдасканаліць сістэму феад. гаспадаркі, увяла новыя нормы землекарыстання і павіннасцей. Прынцыпы Б. па рацыяналізацыі феад. гаспадаркі выкарыстаны пры ажыццяўленні аграрнай рэформы ў Вял. кн. Літ. (гл. *Валочная памера, «Устава на валокі»*). Садзейнічала каланізацыі сялянамі неасвоеных зямель. У лют. 1556 выехала ў Італію.

Літ.: Пичета В. И. Белоруссия и Литва XV—XVI вв. (Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). М., 1961, с. 11—42; Pociecha W. Królowa Bona (1494—1557). Czasy i ludzie odrodzenia, t. 4, Poznań, 1958.

М. Ф. Спірыдонаў. Мінск.

БОНДАР Аляксей Георгіевіч [н. 2(15).10. 1908, в. Касцяшы Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну, дзяржаўны дзеяч БССР. Засл. юрыст БССР (1968). З сялян. Чл. КПСС з 1930. У 1935 скончыў Бел. дзярж. прававы ін-т пры НКЮ БССР. З 1935 у органах пракуратуры Беларусі. З ліп. 1941 у складзе Мінскага падпольнага абкома КПБ. У 1941—42 нам. камандзіра *Мінскага партызанскага злучэння*. У 1943—44 упаўнаважаны Цэнтр. штаба партыз. руху пры штабе Бранскага фронту. З 1944 старшыня Вярх. суда БССР. З 1945 сакратар Прэзідыума Вярх. Савета БССР, з 1949 пракурор БССР, з 1967 старшыня Вярх. суда БССР. На XIX—XXVI з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—5-га скл., Вярх. Савета БССР 2, 3, 6 і 7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



БОНДАРАВА Надзея Васілеўна (н. 14.12. 1925, г. Саратаў), беларускі савецкі вучоны ў галіне інфекцыйных хвароб. Д-р мед. н. (1969). Чл. КПСС з 1961. У 1948 скончыла Саратаўскі мед. ін-т, працавала там ардынатарам, асістэнтам (1948—55). З 1955 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў на кафедры інфекцыйных хвароб (з 1964 заг. кафедры, з 1967 прарэктар). Асн. працы па вывучэнні клініка-біяхім. асаблівасцей і аддаленых вынікаў інфекцыйнага гепатыту ў дзяцей, па дыягностыцы брушнога тыфу.

Тв.: Посевы костного мозга в диагностике брюшного тифа. «Советская медицина», 1951, № 12; Болезнь Боткина у детей. У кн.: Основы диагностики и лечения некоторых детских болезней, 2 изд., Мн., 1964; Хронический гепатит у детей, у кн.: Некоторые вопросы патологии детского возраста, Мн., 1967.

БОНДАРАЎ Аляксандр Мітрафанавіч (н. 30.5.1923, с. Нікалаеўка Бугурусланскага пав. Самарскай губ.), Герой Сав. Саюза (1944). Беларус. З сялян. Чл. КПСС з 1944. У першыя дні Айч. вайны добраахвотнікам пайшоў на фронт. Удзельнік баёў на Варонежскім, 1-м і 4-м Укр. франтах, вызвалення Белгарада, Сумаў, Кіева, Прагі. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Кіева. Увод аўтаматчыкаў на чале з Б. аваладаў востравам, потым захапіў плацдарм на правым беразе і адбіваў контратакі ворага да надыходу асн. частцей. Жыве ў г. Похвісневе Куйбышаўскай вобл.



БОНСКІ ДАГАВОР, гл. *«Агульны дагавор» 1952.*

БОНЧ-АСМАЛОЎСКІ Анатоль Восіпавіч (1857, Віцебск — 23.9.1930), рэвалюцыянер-народнік, дзеяч арганізацый *«Зямля і воля»* і *«Чорны перадзел»*. Рэвалюц. дзейнасць пачаў у час навучання ў Пецярбургскім ун-це (з 1876), вёў прапаганду сярод сялян, рабочых, студэнтаў, удзельнічаў у наладжванні падпольнай друкарні арг-цыі «Чорны перадзел» у Мінску. Дакументамі Б.-А. карыстаўся М. І. *Кібальчыч*, каб мець магчымасць у хім. лабараторыі ун-та ставіць доследы па вырабе бомбаў. У 1879 Б.-А. арыштаваны і сасланы пад нагляд паліцыі ў маёнтак бацькі ў в. Блонь Ігуменскага пав. Мінскай губ. Рэвалюц. агітацыю вёў і тут, за гэта ў 1882 і 1897 арыштоўваўся, а ў 1901 за стварэнне гуртка самаадукацыі сялян вёскі Блонь разам з яго ўдзельнікамі сасланы ў Сібір. Актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыі 1905—07: друкаваў і распаўсюджваў рэвалюц. л-ру, змагаўся на барыкадах Прэсні ў Маскве. У Блоні з жонкай В. І. *Вахоўскай* і сынамі стварыў філіял Усерасійскага сялянскага саюза, за гэта ўся сям'я Б.-А. прыцягнута да судовай адказнасці. Пасля Кастр. рэвалюцыі выбраны чл. выканкома Уладзімірскага губ. Савета сялянскіх дэпутатаў. Аўтар успамінаў.



Тв.: Ліберальна-апазіцыйны рух на Беларусі, у зб.: Беларусь, Мн., 1924.

БОНЧ-АСМАЛОЎСКІ Глеб Анатолевіч [22.10(3.11).1890, маёнтак Блонь Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 1.11.1943], савецкі антра-



полаг і археолаг. Д-р гістар. н. Сын А. В. *Бонч-Асмалоўскага* і В. І. *Вахоўскай*. Скончыў Мінскае камерцыйнае вуч., Петраградскі ун-т (1923). У 1924—30 асістэнт кафедры антрапалогіі Ленінградскага ун-та. З 1930 навук. супрацоўнік Геал. ін-та АН СССР і Дзярж. акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (з 1959 Ін-т археалогіі АН СССР). Арганізатар секцыі выкапнёвага чалавека II Міжнар. канферэнцыі Асацыяцыі па вывучэнні чацвярцічнага перыяду Еўропы (1932) і выстаўкі па чацвярцічным перыядзе СССР. Удзельнік этнагр. і археал. экспедыцый на Каўказе і ў Крыме. У 1926—27 і 1934 Б.-А. з К. М. *Палікарповічам* займаўся пошукамі палеалітычных паселішчаў на тэр. Гомельскай і Смаленскай абл. (Бердыж, Гамкава, Каменная Гара). У час археал. раскопак у пячоры Кіік-Каба (Крым, 1923—24) выявіў пласты з прыладамі працы ніжняга палеаліту, часткі шкілета выкапнёвага чалавека (неандэртальца) і шкілет дзіцяці. Апісаў спосабы вырабу і функцыі каменных прылад працы першабытнага чалавека, паказаў пераемнасць культуры і фіз. тыпу чалавека ранняга і позняга палеаліту.


Тв.: Палеолит Крыма, в. 1—3, М.—Л., 1940—54.

БОНЧ-БРУЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч [9(21).2.1888, Арол — 7.11.1940], савецкі вучоны ў галіне радыётэхнікі. Чл.-кар. АН СССР (1931). У 1909 скончыў інж. вуч. ў Пецярбургу. З 1922 праф. Маскоўскага вышэйшага тэхн. вуч., з 1932 праф. Ленінградскага эл.-тэхн. ін-та сувязі, які з 1940 носіць імя Б.-Б. У 1916—25 стварыў канструкцыю магутнай генератарнай радыёлямпы з вадзяным ахаладжэннем, упершыню арганізаваў вытв. айчынных радыёлямпаў. Па заданні У. І. Леніна спраектаваў першую ў свеце магутную для таго часу радыёвяшчальную станцыю, пабудаваную ў Маскве ў 1922. Пад кіраўніцтвам Б.-Б. распрацаваны каротказвалевыя накіраваныя антэны, шматкамерны магнетрон, пабудаваны каротказвалевыя лініі далёкай радыёсувязі. Працы па радыётэхніцы, радыёвяшчанні, па пытаннях далёкай сувязі па кароткіх хвалях.

Тв.: Собрание трудов, М.—Л., 1956.

Літ.: Остряков П. А. Михаил Александрович Бонч-Бруевич. М., 1953.

БОНЧ-БРУЕВІЧ Міхаіл Дамітрыевіч [24.2 (8.3).1870, Масква — 3.8.1956], ваенны дзеяч, геадэзіст, ген.-л. (1944). Д-р ваенных н. і д-р тэхн. н. Брат У. Дз. *Бонч-Бруевіча*. З сям'і каморніка, выхадца з Магілёўскай губ. Скончыў Межавы ін-т, Маскоўскі ун-т, Акадэмію ген. штаба (1898), у ёй з 1907 выкладаў тактыку. У 1-ю сусв. вайну ген.-кватэрмайстар штаба 3-й арміі (з ліп. 1914), штаба Паўн.-Зах. фронту (з вер. 1914), нач. штаба 6-й арміі (з крас. 1915), нач. штаба арміі Паўн. фронту (жн. 1915 — люты 1916). Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 нач. Пскоўскага гарнізона, чл. выканкома Пскоўскага Савета. З 29.8.1917 галоўнакамандуючы арміі Паўн. фронту, з 27.9.1917 чл. выканкома Магілёўскага Савета і нач. Магілёўскага гарнізона. У час Кастр. рэвалюцыі перайшоў на бок Сав. улады. 7(20).11.1917 СНК РСФСР прызначыў Б.-Б. нач. штаба Вярх. галоўнакамандуючага. З 4.3.1918 ваенны кіраўнік Вышэйшага Ваеннага Савета; з чэрв. да жн. 1919 нач. Палявога штаба Чырв. Арміі. У сак. 1919 узначаліў Вышэйшае геадэзічнае ўпраўленне, у 1925 дзярж. тэхнічнае бюро «Аэрафотаздымка». У 1939—49 рэдагаваў 9-томнае выданне даведніка «Геадэзія».





Тв.: Потеря нами Галиции в 1915 г., ч. 1—2, М., 1920—26; Аэрофотосъемка, М., 1931; Геодезия на службе социалистического хозяйства, М.—Л., 1934; Вся власть Советам. [Воспоминания], М., 1964.

Э. М. Савіцкі. Мінск.

БОНЧ-БРУЕВІЧ Уладзімір Дзмітрыевіч [29.6(11.7).1873, Масква — 14.7.1955], прафесіянальны рэвалюцыянер, дзяржаўны і партыйны дзеяч, гісторык, этнограф, літаратуразнавец. Д-р гістар. н. (1938). З сям'і каморніка, выхадца з Магілёўскай губ. Чл. КПСС з 1895. У 1889 за арганізацыю выступлення студэнтаў выключаны з Межавага ін-та і асланы пад нагляд паліцыі ў Курск, там скончыў каморніцкае вуч. У 1892 вярнуўся ў Маскву, уваходзіў у «Маскоўскі рабочы саюз». Прапагандаваў марксізм сярод рабочых, наладзіў друкаванне на гектографах і распаўсюджванне нелегальнай л-ры. У 1895—96 удзельнічаў у арганізацыі майстэрні па вырабе мімеографаў і забеспячэнні імі с.-д. арг-цый Расіі; стварыў падпольную друкарню і па парадзе У. І. Леніна перадаў яе сацыял-дэмакратам Пецярбурга; упершыню выдаў па рус. мове працу К. Маркса «Да крытыкі палітычнай эканоміі» (1896). У 1896 выехаў у Швейцарыю для сувязі з *групай «Вызваленне працы»*. Наладзіў дастаўку з-за мяжы ў Расію рэвалюцыйнай літаратуры, друкарскіх станкоў; супрацоўнічаў у газеце *«Искра»*, загадваў партыйнай тэхнікай (друкарня, брашуравочная, экспедыцыя, пашпартнае бюро, транспарціроўка), бібліятэкай і архівам РСДРП у Жэневе; удзельнічаў у стварэнні газ. «Вперед» (1904), у падрыхтоўцы III з'езду РСДРП. У пач. 1905 вярнуўся ў Пецярбург, актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыі 1905—07. У 1906—17 сакратар Пскоўскага р-на Пецярбургскага к-та РСДРП, пастаянны чл. кансультацыйнай групы с.-д. фракцыі II—IV Дзяржаўных дум, чл. рэдакцыі *«Правды»*; наладжваў выданне газ. «Волна», «Вперед», «Эхо», узначальваў бальшавіцкае выд-ва «Жизнь и знание». Неаднойчы арыштоўваўся. У час Лют. рэвалюцыі 1917 арганізаваў выступленне Валынскага палка і кулямётнага батальёна; на чале атрада салдатаў заняў друкарню газ. «Копейка» і наладзіў выпуск газ. «Известия Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов», рэдагаваў газ. «Рабочий и солдат», быў чл. выканкома Петраградскага Савета. У дні Кастр. рэвалюцыі камендант раёна Смольны — Таўрычаскі, чл. К-та рэвалюц. абароны Петраграда, старшыня к-та па барацьбе з сабатажам і контррэвалюцыяй. У 1917—20 кіраўнік справаў СНК РСФСР; потым на навук. і выдавецкай рабоце: старшыня і рэдактар выд. «Жизнь и знание» (1921—37), дырэктар Дзярж. літ. музея (1933—39), Музея гісторыі рэлігіі АН СССР у Маскве (1946—47), Музея гісторыі рэлігіі і атэізму АН СССР у Ленінградзе (1947—55). Аўтар прац па гісторыі рэвалюц. руху, л-ры, этнаграфіі, гісторыі рэлігіі і атэізму. Узнаг. ордэнам Леніна (1954).

Тв.: Избр. соч., т. 1—3, М., 1959—63.

Літ.: Владимир Дмитриевич Бонч-Бруевич, М., 1958 (бібліягр.).

Э. М. Савіцкі. Мінск.

БОНЫ (ад лац. bonus добры), у капіталістычных краінах крэдытныя дакументы, якія выпускаюцца дзяржаўным казначэйствам, фірмамі, прадпрыемствамі, установамі і даюць уладальніку права атрымаць у вызначаны тэрмін пэўную суму грошай або інш. каштоўнасцей; від грашовых сурагатаў. У СССР выпуск Б. забаронены.

БОР (Bohr) Нільс Генрык Давід (7.10.1885, Капенгаген — 18.11.1962), дацкі фізік, адзін са стваральнікаў квантавай тэорыі. Чл. Дацкай АН (1918), замежны чл. АН СССР (1929) і інш. АН свету. З 1916 узначальваў кафедру тэарэт. фізікі Капенгагенскага ун-та, з 1920 і да канца жыцця кіраваў Ін-там тэарэт. фізікі пры гэтым ун-це. Асн. працы па квантавай тэорыі атама, тэорыі дзялення атамнага ядра і па пытаннях праходжання зараджаных часцінак праз рэчыва. У 1913 прапанаваў квантавую мадэль атама (гл. *Бора тэорыя*), якая адыграла важную эўрыстычную ролю ў стварэнні квантавай механікі. Сфармуляваў *адпаведнасці прынцып* і прынцып дапаўняльнасці. У апошнія гады, пераадольваючы ўплыў пазітывізму, падыходзіў да матэрыяліст. трактоўкі шэрагу праблем квантавай механікі і тэорыі пазнання. Нобелеўская прэмія 1922, Міжнар. прэмія «Атам для міру» 1957.



Тв.: Рус. пер. — Избр. научные труды в 2-х т., т. 1, М., 1970; Три статьи о спектрах и строении атомов, М.—П., 1923; Атомная физика и человеческое познание, М., 1961.

Літ.: Нильс Бор. Жизнь и творчество. Сб. ст., [пер. з дат.], М., 1967; Мур Р. Нильс Бор — человек и ученый, пер. с англ., М., 1969.

БОР (Borum), B, хімічны элемент III групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 5, ат. м. 10,81, III-валентны. Адкрыты ў 1808 франц. вучонымі Ж. Гей-Люсакам і Л. Тэнарам. Вядомы два стабільныя ізатопы ^{11}B (81%), ^{10}B (19%) і некалькі недаўгавечных, атрыманых штучна. У зямной кары змяшчаецца $3 \cdot 10^{-4}$% па масе ў саставе *бураксу*, борнай к-ты H_3BO_3 і соляў борных к-т (баратаў). Б. — тугаплаўкае рэчыва з паўправадніковымі ўласцівасцямі, цёмна-бурага колеру, t пл. 2300 °С, t кіп. 2550 °С, існуе ў крышталічным (шчыльн. 2340 *кг/м*^{3}) і аморфным (шчыльн. 1730 *кг/м*^{3}) станах. Крышталічны Б. па цвёрдасці набліжаецца да алмазу. Б. — неметал, у вадзе не растворваецца, малаактыўны: пры нагрэванні рэагуе з кіслародам і інш. неметаламі, з расплаўленымі металамі ўтварае барыды, з вадародам непасрэдна не рэагуе, але ўскосным шляхам атрымліваюць боравадароды (бараны), з вугляродам даюць вельмі тугаплаўкія і цвёрдыя карбіды. Атрымліваюць Б. з борнай к-ты або тэрмічным раскладаннем пары бромістага бору на танталавым дроце. Ужываюць у металургіі, шкляной і керамічнай прамысл., у медыцыне і с. гасп. Б. і яго злучэнні выкарыстоўваюцца як ахоўныя матэрыялы ад нейтроннага выпрамянення і як рэгулятары ланцуговых ядзерных рэакцый.

Літ.: Бор, его соединения и сплавы, Киев, 1960.

В. В. Свірыдаў. Мінск.

БОР, хваёвы лес, пераважна на пясчаных глебах. Часам Б. памылкова называюць любы хваёвы лес — як на сухадоле, так і на забалочаных месцах і балотах. Б. даюць высакаякасную драўніну і жывіцу; каля гарадоў утвараюць ахоўныя зялёныя зоны. Хваёвыя лясы спрыяюць здароўю людзей, таму ў Б. звычайна будуюць дамы адпачынку і санаторыі. Найб. вядомыя ў СССР Бузулукскі, Хранаўскі і інш. Б. існуюць як помнікі прыроды і аб'екты навук. даследаванняў. У БССР пашыраны Б. імшыстыя, верасовыя, чарнічныя, лішайнікавыя і інш.

Літ.: Растительный покров Белоруссии, Мн., 1969.

БОР, вёска ў Навасёлкаўскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., на р. Цітаўка. Цэнтр калгаса «Іскра». За 11 *км* на З ад Мар'інай Горкі (адм. ц. раёна) і чыг. ст. Пухавічы, 74 *км* ад Мінска. 704 ж., двароў 187 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячыя яслі, адз. сувязі, магазін. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. акупанты спалілі вёску, загубілі 235 мірных жыхароў.

БОРА ТЭОРЫЯ, першая квантавая тэорыя атама, якую прапанаваў Н. *Бор* у 1913. Аснова Б. т. — два пастулаты: пра існаванне ўстойлівых (стацыянарных) станаў і пра квантавыя пераходы з выпрамяненнем (гл. *Атамная фізіка*).

Пастулаты Бора пацвярджаны эксперыментальна і выконваюцца для ўсіх мікраскапічных сістэм (атамных ядраў, атамаў, малекул і інш.). Каб знайсці магчымыя значэнні энергіі і інш. характарыстыкі стацыянарных станаў, Бор разглядаў рух электронаў вакол ядра паводле законаў механікі Ньютана (класічнай механікі) пры дапаўняльных, т. зв. квантавых умовах. Пры гэтым у найпрасцейшым выпадку атама вадароду электрон можа рухацца вакол ядра па кругавых ці эліптычных арбітах пэўных памераў, якія павялічваюцца з павелічэннем энергіі атама ў адпаведных стацыянарных станах. Канкрэтныя мадэльныя ўяўленні Б. т. пра рух электрона ў атаме па строга вызначаных арбітах пазней заменены ўяўленнямі *квантавай механікі* — паслядоўнай тэорыі мікраскапічных з'яў, якая апісвае гэты рух з улікам хвалевых уласцівасцей электрона. *М. А. Ельяшэвіч.* Мінск.

БОРАРГАНІЧНЫЯ ЗЛУЧЭННІ, гл. *Элементаарганічныя злучэнні.*

БОРАЎНА, возера ў бас. р. Ула, левага прытока Зах. Дзвіны, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Даўж. 1,1 *км*, найбольшая шыр. 0,6 *км*, сярэдняя 0,5 *км*. Рэльеф вадазбору (6,5 *км*²) плоска-хвалісты, марэнны. Злучана пратокамі з азёрамі Нюля і Глыбочыца. Водзяцца шчупак, плотка, лінь, судак, акунь, мянтуз.

БОРАЎНА, вёска ў Лепельскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл., каля воз. Бораўна (0,5 *км*). Цэнтр калгаса «VI з'езд Саветаў». За 7 *км* на У ад Лепеля, 122 *км* ад Віцебска, на шашы Лепель — Чашнікі. 259 ж., дварoў 81 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

БОРДЖА, Борджыя (італьян. Borgia, ісп. Borja), іспанскі арыстакратычны род, які ў 15 ст. перасяліўся ў Італію і адыграў значную ролю ў гісторыі краіны.

Найбольш вядомыя: папа рымскі Каліст III (1455—58) і яго пляменнік папа Аляксандр VI (1492—1503), дзеці апошняга Чэзарэ (1475 ці 1476—1507) і Лукрэцыя (1480—1519). Аляксандр VI і Чэзарэ імкнуліся аб'яднаць Італію пад сваёй уладай і выкарыстоўвалі розныя сродкі: подкупы, забойствы, шмат разоў выдавалі замуж Лукрэцыю. Б. сталі сімваламі маральнай разбэшчанасці. Любілі акружаць сябе выдатнымі дзеячамі навукі і мастацтва. Пры іх двары працавалі Д. Брамантэ, Мікеланджэла, Рафаэль, Леанарда да Вінчы, Тыцыян.

БОРЗАБАГАТЫ Уладзіслаў Канстанцінавіч [23.4(5.5).1831, маёнтак Рутка Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 1886], удзельнік паўстання 1863 на Беларусі. У 1849 за ўдзел у *Братнім саюзе літоўскай моладзі* выключаны з Мінскай гімназіі без права паступлення ў інш. навуч. ўстановы. З 1856 слухаў лекцыі ў Маскоўскім ун-це, працаваў урачом у Навагрудку. У 1863 паўстанцкі камісар Навагрудскага пав. Як перакананы дэмакрат і аднадумец К. Каліноўскага абараняў інтарэсы сялян, патрабаваў экспрапрыяцыі памешчыкаў. Пасля задушэння паўстання завочна прыгавораны да пакарання смерцю. У 1865 эмігрыраваў у Парыж. У час Парыжскай камуны прызначаны гал. медыкам парыжскага шпіталя. У 1874 вярнуўся на радзіму і сасланы ў Кастрамскую губ., там працаваў земскім урачом. Памёр у Любешаве Мінскай губ.

Літ.: Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы); [Borzobohaty K.] Zyciorys powstańca z 1863 r., Wilno, 1938 (пад крыптан.: К. В.).

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

БОРКАВІЧЫ, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на р. Дрыса. Чыг. ст. на лініі Полацк — Даўгаўпілс. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Боркавічы». За 20 *км* на ПдУ ад Верхнядзвінска, 146 *км* ад Віцебска. 1750 ж., дварoў 606 (1970). Механізаваны лесасклад, дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне. Прафесійна-тэхн. вучылішча механізацыі с. гасп., сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад і яслі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 9 магазінаў. 2 брацкія магілы 158 сав. воінаў і 70 жыхароў вёскі.

БОРКІ, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Боркі». За 23 *км* на Пд ад Бярозы, 28 *км* ад чыг. ст. Бяроза-Картузская, 88 *км* ад Брэста. 226 ж., дварoў 88 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БОРМАТАЎ Усевалад Яўстаф'евіч (н. 7.11.1928, с. Міцькаўка Навазыбкаўскага пав. Бранскай губ.), беларускі савецкі генетык. Чл.-кар. АН БССР (1970). Д-р біял. н. (1968). Чл. КПСС з 1951. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1952). Нам. дырэктара Ін-та біялогіі АН БССР (1955—60), заг. аддзела эксперым. поліплаідыі Ін-та біялогіі АН БССР (1960—63), нам. дырэктара Ін-та генетыкі і цыталогіі АН БССР (1963—67), заг. аддзела эксперым. поліплаідыі Ін-та генетыкі і цыталогіі АН БССР (з 1967). Эксперыментальна атрымаў паліплоідныя (гл. *Поліплаідыя*) формы цукровых буракоў, даследаваў іх біял. асаблівасці і вызначыў селекцыйную каштоўнасць. Даследаваў асаблівасці *ветэрозісу* ў паліплоідных раслін, зменлівасць і спадчыннасць у гібрыдаў.



Тв.: Гетерозис (Теория и методы практического использования), Мн., 1961; (разам з М. В. Турбіным) О принципах и методах селекции триплоидных гибридов сахарной свеклы, у кн.: Полиплоидия и селекция. Труды совещания 14—18 янв. 1963, М.—Л., 1965; (разам з І. В. Матошкам і У. К. Саўчанкам) Influence of polyploidy on the chance of the content in some chemical compounds in the pollen of sugarbeet, «Acta Agronomica Academiae Scientiarum Hungaricae», 1966, t. 15; (разам з У. К. Саўчанкам і Г. Д. Ахраменка) Взаимосвязи развития признаков полиплоидных гибридов сахарной свеклы и их родительских форм, «Цитология и генетика», 1969, т. 3, № 5.

БОРМАШЫНА, гл. *Стаматалагічныя прылады.*

БОРН (Born) Макс (11.12.1882, Вроцлаў — 5.1.1970), нямецкі фізік. Замежны чл. АН СССР (1934) і інш. акадэмій. У 1915—33 праф. ун-таў у Берліне, Гётынгене, у 1933—53 праф. ун-таў у Кембрыджы і Эдынбургу. Асн. працы па пытаннях дынамікі крышталічных рашотак, квантавай механікі, тэорыі будовы атама і тэорыі адноснасці. Упершыню даў імавернаснае тлумачэнне квантавай механікі. Нобелеўская прэмія 1954.

Тв.: Рус. пер.— (разам з Хуан Кунем) Динамическая теория кристаллических решеток, М., 1958; Эйнштейновская теория относительности, М., 1964; Атомная физика, 3 изд., М., 1970.

Літ.: Суворов С. Г. Макс Борн и его философские взгляды, у кн.: Борн М. Физика в жизни моего поколения, пер. с англ., нем. и франц., М., 1963.

БОРТ (старафранц. bort помесь), тэхнічная назва аярністых, афарбаваных або з дэфектамі *алмазаў*, непрыгодных для агранкі і выкарыстання як каштоўных камянёў. Ужываюцца ў тэхніцы (шліфаванне, алмазнае бурэнне свідравін, рэзка і свідраванне шкла каштоўных камянёў, праўка шліфавальных кругоў, зубоў «алмазных» пілаў і інш.). Гл. таксама *Алмаз.*

БОРТНІКІ, вёска ў Пліскім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 37 *км* на ПнУ ад Глыбокага, 196 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Зябкі. 141 ж., дварoў 47 (1970). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт.

БОРТНІЦТВА, лясное пчалярства, адзін з найбольш старадаўніх промыслаў на Беларусі. Найчасцей дзікія пчолы знаходзіліся ў натуральных борцях — дуплах дрэў. Каб зрабіць штучную борць, ссякалі вяршаліну дрэва, рабілі ў ім келіхападобнае паглыбленне, у якім застойвалася вада. Выгнілую сярэдзіну выскрабалі і зверху ствол закрывалі яловым лубам ці бяростай, збоку праразалі лаз для пчол. Пазней рабілі вуллі-калоды, якія прывязвалі да дрэва або ставілі на дашчаныя палаці, т. зв. адзёр. Каб залучыць пчол, новыя борці ці вуллі з сярэдзіны акраплялі настоем духмяных траў або мёдам, у борці клалі воск ці пустыя соты. Для аховы борцяў ад драпежнікаў (куніц, асаблівa мядзведзяў) рабілі спец. прыстасаванні: падмосткі вакол дрэва накшталт бараны зубамі ўніз, у дрэва забівалі пажы, падвешвалі петлі, званочкі, бразготкі і інш. На Беларусі, асабліва на Палессі, Б. існавала да пач. 20 ст.

Літ.: Сержпутовский А. К. Бортничество в Белоруссии, у кн.: Материалы по этнографии России, т. 2, СПб., 1914. *Л. А. Малчанава,* Мінск.

БОРХАЎ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на ПнУ ад Рэчыцы, 40 *км* ад Гомеля, 7 *км* ад чыг. ст. Якімаўка. 535 ж., дварoў 228 (1970). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Каля Б. 2 гарадзішчы мілаградскай культуры.

БОСНІЯ І ГЕРЦАГАВІНА (Bosna і Hercegovina), народная рэспубліка ў складзе Югаславіі. Займае цэнтр. ч. краіны. Пл. 51 тыс. км²; нас. 3,7 млн. чал. (1967) — сербы, баснякі, харваты. Мова сербскахарвацкая, адрозненні паміж народамі толькі рэлігійныя: веруючыя сербы — праваслаўныя, харваты — католікі, баснякі — мусульмане. Адм. ц.— Сараева. Большую частку Б. і Г. займаюць Баснійскія Рудныя горы (г. Враніца, 2107 *м*), складзеныя пераважна з слянцаў, і Дзінарскае нагор'е (выш. каля 1000—1600 *м*) — з вапнякоў; характэрны карст. На Пн нізіна па р. Саве. Ёсць жал. руда, храміты, марганец, медзь, буры вугаль, баксіты. Клімат умерана кантынентальны. Рэкі бас. Дуная.

У старажытнасці на тэр. Б. і Г. жылі ілірыйскія плямёны. У 3 ст. да н. э. ўзніклі рабаўладальніцкія дзяржавы, якія да 1 ст. н. э. былі заняволены Рымам. У 5 ст. тэрыторыя Б. і Г. часова трапіла пад уладу каралеўства остготаў, потым адышла да Візантыі. Засяленне славянамі пачалося ў 6—7 ст. Упершыню Боснія ўпамінаецца ў крыніцах 10 ст. Прыблізна ў 2-й пал. 10—11 ст.— паліт. адзінка на чале з банам. З пач. 12 ст. стала самастойнай, але неўзабаве папала пад уладу Венгерскага каралеўства. У выніку візант.-венг. войны 1166—67 трапіла ў залежнасць ад Візантыі, праз 13 гадоў — зноў ад Венгрыі. Пры Твёртку I (1353—91) абвешчана каралеўствам, пашырыла тэр. (землі ў басейнах рэк Півы, Тары і Ліма, а-вы Брач, Хвар і Корчула, некалькі гарадоў). Ва ўмовах феад. анархіі, якая пачалася пасля смерці Твёртка I, правіцель паўд. часткі каралеўства С. Вукчыч абвясціў сябе (1448) герцагам (адсюль назва яго ўладанняў Герцагавіна). У 1463 туркі захапілі Боснію, да 1528 — усе землі Герцагавіны. Масавы сялянскі рух супраць тур. панавання асабліва ўзмацніўся з пач. 19 ст. (паўстанні 1804—13, 1834, 1852—62 і інш.) і вылiўся ў *Герцагавінска-баснійскае паўстанне 1875—78*, якое выклікала міжнар. крызіс (гл. *Баснійскія крызісы*). Паводле рашэння Берлінскага кангрэсу 1878 Аўстра-Венгрыя акупавала Б. і Г., а ў 1908 анексіравала яе. Пасля распаду Аўстра-Венгрыі (1918) яе паўд.-слав. землі, у т. л. Б. і Г., а таксама Сербія і Чарнагорыя аб'ядналіся ў Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 — Югаславія).

Развіта дрэва- і металаапрацоўчая, металург., хім., маш.-буд., тэкст., харч., горная прамысловасць. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, авечак, коз. Слівавыя і яблыневыя сады, вінаграднікі. Сеюць пшаніцу і кукурузу, з тэхнічных — тытунь, лён, цукр. буракі, сланечнік. Лясная гасп. Параўнальна густая сетка чыгунак.

БОСТАН (Boston), найбольшы горад і адм. ц. штата Масачусетс, у паўн.-ўсх. прамысловым раёне ЗША. Засн. ў 1630. Гал. порт Новай Англіі на Атлантычным узбярэжжы. Вузел чыгунак і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 3250 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1967). Адзін з самых важных прамысл. і гандл.-фін. цэнтраў ЗША. Прадпр. металаапр., суднабудаўнічай, электра- і радыётэхн., тэкст. (пераважна шарсцяной), маш.-буд., гарбарна-абутковай, харч., паліграф. прамысловасці.

У старым горадзе абярэгліся будынкі 17—18 ст.: Лацінская школа (1635), Старая паўн. ц. (1723), Старая паўднёвая ц. (1729), Стары паўднёвы дом сходаў (1729, перабудаваны ў 1789), Каралеўская капліца (1749—54); Фанейл-хол (1740—42), Стары дом штата (1748), Новы дом штата (1795—98, усе арх. Ч. Балфінча), жылыя дамы (дом Блейка, 1648; дом 1660; дом Гарысана, 1795—96).

Новы горад, які пачаў развівацца ў 19—20 ст., мае рэгулярную планіроўку, паўкольца паркаў. Сярод будынкаў: таможня (1874), Музей прыгожых мастацтваў (1870—1909), канцэртная зала (з 1881), ц. Тройцы (1872, арх. Х. Х. Рычардсан), Публічная б-ка (1852—95), дом кампаніі Джон Хэнкак Білдынг (1950). У Б. і яго прыгарадах Гарвардскі ун-т (з 1636), Масачусецкі тэхналаг. ін-т, кансерваторыя.

БОСХ (Bosch; сапр. Хіеранімус ван Акен) Хіеранімус (каля 1450, Хертагенбас,

Паўн. Брабант — 1516), нідэрландскі мастак. Сюжэты карцін Б. ўзяты з хрысціянскіх легендаў («Пакланенне вешчуноў», «Нясенне крыжа», «Выпрабаванне св. Антонія»), з фальклору («Воз сена») і сатыр. л-ры («Карабель дурняў», каля 1500—10). У яго работах фантаст. гратэскавыя і алегарычныя вобразы спалучаюцца са смелай рэаліст. трактоўкай нар. тыпаў і пейзажаў. Б. ўласцівыя саркаст. ўспрыманне жыцця, павучальнасць.

Літ.: Всеобщая история искусств, т. 3, М., 1962, с. 337—341.

БОТ (галанд. boot), невял. вёсельна-маторнае, аднамачтавае парусное ці парусна-маторнае судна для перавозкі людзей і грузаў або спец. прызначэння (Б. лоцманскі, выратавальны, дэсантны).

БОТКІН Сяргей Пятровіч [5(17).9.1832, Масква — 12(24).12.1889], рускі тэрапеўт-клініцыст, грамадскі дзеяч. Скончыў мед. ф-т Маскоўскага ун-та (1855). З 1861 праф. тэрапеўтычнай клінікі Пецярбургскай медыка-хірург. акадэміі. Упершыню ў Расіі стварыў клініка-эксперым. лабараторыю, дзе даследаваў фізіял. і фармакалагічнае дзеянне лякарстваў. Вывучаў пытанні фізіялогіі і паталогіі арганізма, увёў у клініку лабараторна-эксперым. метады даследаванняў. Развіваў погляды І. М. Сечанава, які разумеў арганізм як адзінае цэлае, якое непарыўна звязана з асяроддзем і кіруецца нервовай сістэмай. Гэты кірунак у медыцыне І. П. Паўлаў назваў нервізмам. Б. распрацаваў шэраг складаных пытанняў паталогіі ўнутраных органаў, інфекцыйных хвароб, дыягностыку і лячэнне блукальнай ныркі. У 1888 выказаў думку пра інфекцыйную прыроду катаральнай жаўтухі (гл. *Боткіна хвароба*). Лічыў, што гал. задача практ. медыцыны — папярэджанне хваробы. Адзін з заснавальнікаў ваенна-палявой тэрапіі. У 1861 у Пецярбурзе адкрыў бясплатную амбулаторыю, у 1880 бальніцу. З 1878 старшыня Т-ва рускіх урачоў.

Тв.: Курс клиники внутренних болезней и клинические лекции, т. 1—2, М., 1950.
Літ.: Гукасян А. Г. Великий клиницист-ученый, «Терапевтический архив», 1953, т. 25, в. 1.

БОТКІНА ХВАРОБА (інфекцыйная жаўтуха), хвароба, якая выклікаецца фільтроўным вірусам і характарызуецца запаленчым паражэннем печані. Апісана ў 1888 рус. урачом С. П. *Боткіным*. Крыніца заражэння — хворы чалавек і вірусаносьбіт. У арганізм вірус трапляе з ежай, вадой, паветрана-кропельным шляхам, а таксама пры мед. маніпуляцыях (ін'екцыі, уліванні крыві, сываратак, плазмы) недастаткова прастэрылізаванымі інструментамі. На Б. х. найчасцей хварэюць дзеці, цяжарныя жанчыны і асобы з аслабленым арганізмам.

Інкубацыйны перыяд доўжыцца ад 2—3 тыдняў да 4—6 месяцаў. Б. х. бывае з жаўтухай і без яе. Жаўтушная форма хваробы пачынаецца з павышэння т-ры цела, агульнай слабасці, страты апетыту, моташнасці, ірвоты, расстройства страўлівання. Часам бываюць катар верхніх дыхальных шляхоў, боль у мышцах і суставах. Праз 5—8 дзён пачынае балець у правым падрабрыпні, павялічваецца печань, мача робіцца цёмная, кал траціць колер, развіваецца жаўтуха, свярбіць скура. Безжаўтушную форму Б. х. распазнаюць з дапамогай спец. лабараторных метадаў. Бываюць рэцыдывы, можа развіцца хранічная форма хваробы або цыроз (дэгенерацыя) печані. Пасля выздараўлення хворы год павінен быць пад наглядам урача.

Лечаць Б. х. ў бальніцы. Асн. мерапрыемствы: пасцельны рэжым, дыэта (вугляводзістая ежа — цукар, мёд, вінаград; тварог, жывёльны бялок — цяляціна, кураціна); многа вадкасці (мінер. воды, сіропы, сокі з садавіны), вітамінатэрапія (B_1, B_{12}, C), прэпараты печані (кампалон, антыанемін). Прафілактыка: ранняя ізаляцыя хворага; дэзінфекцыя памяшкання, бялізны, рэчаў; абеззараджванне калу; строгае выкананне правілаў асабістай гігіены; знішчэнне мух. Асобам, якія былі ў кантакце з хворым (асабліва дзецям), уводзяць *гама-глабулін*.

Літ.: Эпидемический гепатит (Болезнь Боткина), М., 1964; Бутлягина А. П. Сывороточный гепатит, М., 1962. *Дз. В. Палешка.* Мінск.

БОТЧА, рака, левы прыток Свіслачы (бас. Дняпра). Даўж. 26 *км*. Цячэ па Цэнтральнабярэзінскай раўніне ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. Пл. вадазбору 138 *км²*. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,8 *м³/сек*.

БОЎТ Іван Іванавіч (н. 20.7.1932, Мінск), беларускі савецкі архітэктар. У 1961 скончыў будаўнічы ф-т Бел. політэхн. ін-та. З 1952 у Белпрампраекце. Аўтар праектаў прамысл. комплексаў: заводаў у Мінску — гадзіннікавага (1954—56, з Н. Шпігельманам), лічыльных машын (1956—61), радыёзавода (1960—63), электратэхнічнага (1964—65), халадзільнікаў (1965—68), будынка праектнага ін-та Белдзіпрасельбуд (1967—68, з Л. Сагалавым); у Брэсце — дывановага камбіната (1960—63, з Шпігельманам), панчошнай ф-кі (1965—68, з Ж. Сахаравай), гал. абяднанага прамысл. корпуса з-даў электралямпавага і эл.-вымяр. прылад (1965—68, з Л. Афанасьевай, М. Буйлавай і інш.).

БОФАРТА МОРА (Beaufort Sea), заліў Паўн. Ледавітага ак. каля берагоў Паўн. Амерыкі, паміж Аляскай (ад мыса Бараў) і Канадскім Арктычным архіпелагам. Пл. 476 тыс. *км²*. Глыб. да 4683 *м*. Увесь год укрыта лёдам.

БОХАН Антон Адольфавіч [н. 20.1(2.2).1915, в. Каўшанёва Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1945. З 1931 працаваў у МТС, Шаркоўшчынскім райаддзеле НКУС Віцебскай вобл. У Айч. вайну ў тыле ворага ў Дрысенскім р-не. У жн. 1942 арганізаваў партыз. атрад і быў яго камісарам; са студз. 1944 камісар *партызанскай брыгады Асвейскай* імя М. В. Фрунзе. З кастр. 1944 на парт. і гасп. рабоце ў Полацкай і Віцебскай абл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Полацку.

БОХВІЦ Фларыян (4.5.1799, мяст. Мір Навагрудскага пав.— 9.8.1856), філосаф-ідэаліст.

Пач. адукацыю атрымаў у Нясвіжы, вывучаў права ва ун-тах Кіева і Вільні. Чл. Навагрудскай карпарацыі адваката. У 1838 адмовіўся ад дзейнасці адваката і цалкам заняўся навук. працай. У тв. «Форма майго мыслення» (ч. 1—2, 1838—39), «Асновы маіх думак і пачуццяў» (1842) і інш. імкнуўся прымірыць рэліг. ідэі з навукай. Вяршыняй філас. думкі для Б. быў эклектызм, які нібыта здолеў пазбегнуць «крайнасці» філас. вучэнняў і не супярэчыць рэлігіі. Сутнасць грамадскага прагрэсу Б. разумеў дваяка: прагрэс у галіне матэрыяльнай дзейнасці чалавека (пазнанне законаў свету, развіццё прамысловасці, тэхнікі, навукі) і прагрэс у галіне маралі як пазнанне ідэй, што ўвасабляюць боскае адкрыццё. Значную ўвагу аддаваў пытанням выхавання. Выступаў з патрабаваннем прыняць такую сістэму выхавання і адукацыі, якая рыхтавала б людзей, карысных грамадству. *Н. М. Махнач.* Мінск.

БОЦЕЎ Хрыста [25.12.1848(6.1.1849), Калофер — 20.5(1.6).1876], балгарскі рэвалюцыянер-дэмакрат, паэт і публіцыст, нац. герой балг. народа. З сям'і педагога і асветніка Б. Петкава. Вучыўся ў Адэскай гімназіі (1863—65). У 1866 настаўнічаў у Бесарабіі. У 1867 вярнуўся на радзіму, неўзабаве мусіў эмігрыраваць у Румынію. Вялікі ўплыў на фарміраванне сац.-паліт. поглядаў Б. зрабілі В. Бялінскі, А. Герцэн, М. Чарнышэўскі і М. Дабралюбаў. Быў знаёмы з творамі К. Маркса, але ва ўмовах феад. Балгарыі не зразумеў гістар. ролі рабочага класа. Збліжэнне з балг. рэвалюц. дзеячам В. *Левскім* умацавала веру Б. ў нар. паўстанне як адзіны сродак вызвалення радзімы. Супрацоўнічаў у друку балг. палітэмігрантаў, выдаваў шэраг рэвалюц.-дэмакр. газет. Актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы *Красавіцкага паўстання 1876*, у час якога загінуў. Дзень смерці Б. адзначаецца як дзень памяці герояў, што загінулі ў вызв. барацьбе. Першы верш «Да маці» надрукаваў у 1867. Напісаў каля 20 вершаў. Паэзія Б., блізкая да нар.-песенных традыцый, прасякнута высокім грамадз. пафасам, ідэямі нац.-вызв. барацьбы. У вершах апявае абаронцаў прыгнечаных, веліч рэвалюц. подзвігу ў імя народа («Гайдукі», «На смерць Васіла Леўскага», «Хаджы Дзімітр»). Як публіцыст выкрываў тур. прыгнятальнікаў, паслядоўна змагаўся за нац. і сац. вызваленне балг. народа. Літ.-крытычныя артыкулы Б. спрыялі станаўленню рэалізму ў балг. л-ры.



Тв.: Събрани съчинения, т. 1—2, София, 1958; рус. пер.— Избранное, М., 1963; бел. пер.— Маёй першай каханай. [Верш], «Маладняк», 1931, № 2.
Літ.: Державин К. Н. Христо Ботев, М., 1962; Христо Ботев. Библиогр. указатель, М., 1960.

БО ЦЗЮЙ-І (772, правінцыя Шаньсі — 846), кітайскі паэт. Са знатнай, але збяднелай сям'і. Аўтар лірычных вершаў, паэм «Лютня» і «Песня пра бязмежную тугу», востраграмадз. цыклаў «Цыньскія напевы» і «Новыя народныя песні». Выступаў супраць карупцыі, феад. беззаконнасці і вайны. Глыбокі рэалізм, багацце зместу, лёгкасць верша, прастата мовы зрабілі яго паэзію папулярнай у Кітаі, Японіі і ў краінах Еўропы, у т. л. ў СССР.

Тв.: Рус. пер.— Стихи, М., 1958; Лирика, М., 1965.

БОЧВАР Андрэй Анатолевіч [н. 26.7(8.8).1902, Масква], савецкі вучоны ў галіне металазнаўства. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1939). Двойчы Герой Сац. Працы (1949, 1953). У 1923 скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вуч. і выкладаў у ім, з 1930 — у Маскоўскім ін-це каляровых металаў і золата (праф. з 1931), з 1961 у Маскоўскім ін-це сталі і сплаваў. Асн. працы ў галіне крышталізацыі металаў і сплаваў, іх дэфармацыі пры высокіх т-рах і ціску. Распрацаваў тэорыі эўтэктычнай крышталізацыі і ліцейных уласцівасцей сплаваў. Напісаў шэраг падручнікаў па металазнаўстве і тэрмічнай апрацоўцы метал. сплаваў. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1949, 1951, 1953; Ленінская прэмія 1961.



Тв.: Основы термической обработки сплавов, 5 изд., М.—Л., 1940; Металловедение, 5 изд., М., 1956.

БОЧКА ВІЛЕНСКАЯ, даўняя мера сыпучых рэчываў на Беларусі і ў Літве. Паводле пастановы скарбовай камісіі Вял. кн. Літ. (1765) раўнялася 406,7 *л*, прыкладна адпавядала 19 пудам пшаніцы, 18 пудам жыта, 15 пудам ячменю, 10 пудам аўса. Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй Б. в. прыведзена ў суадносіны з рус. мерамі і раўнялася 2 чацвярцям ці 8 асьмінам. У розных раёнах Беларусі існавалі мясцовыя «бочкі»: карцовая, шыпковая, каранковая, гаспадарская, салянка, кракоўка, селядзёўка, памеры якіх адрозніваліся ад Б. в.

БОШКАВІЧ (Bošković) Руджар Іосіп (18.5.1711, Рагуза, Далмацыя — 13.2.1787), харвацкі матэматык і філосаф. Вучыўся і працаваў у Дубраўніку (Далмацыя), Італіі і Францыі. Ганаровы чл. Пецярбургскай АН (з 1760). Займаўся астр. даследаваннямі, даў матэм. трактоўку тэорыі шэрагу астр. інструментаў. Гал. праца — «Тэорыя натуральнай філасофіі...» (1758); у ёй Б. прадказаў некат. ідэі тэорыі адноснасці і сучаснае ўяўленне пра рэчыва.

Літ.: Кольман Э. Жизнь и научная деятельность Руджера Бошковича, у зб.: Вопросы истории, естествознания и техники, в. 2, М., 1956.

БРАВАРСКАЯ Зінаіда Іванаўна [н. 18(31).8.1916, ст. Адэса-Дачная], беларуская савецкая актрыса. Нар. арт. БССР (1967). Чл. КПСС з 1957. У 1937 скончыла Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва імя Луначарскага (Масква). Працавала ў Бел. т-ры юнага гледача імя Крупскай. З 1938 у т-ры імя Я. Купалы (у 1941—50 — у франтавым т-ры Масквы, т-рах Ашхабада, Пензы, Куйбышава). Актрыса выразнага сцэнічнага малюнка, выканаўца драматычных і востраха-рактарных роляў. Найб. значныя: Ірына («Вогненны мост» Б. Рамашова), Ірына Аляксандраўна («Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна), Юлечка («Даходнае месца» А. Астроўскага), Зёлкіна («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Клея («Ліса і вінаград» Г. Фігейрэду), Ніхаль («Дзівак» Назыма Хікмета), Агнія («Традыцыйны збор» В. Розава). Здымалася ў кіно («Гадзіннік спыніўся апоўначы» і інш.). У пастаноўцы Беларускага тэлебачання «Крах» па п'есе А. М. Талстога і П. Шчогалева «Змова імператрыцы» выканала ролю царыцы Аляксандры Фёдараўны. З 1969 выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.





З. І. Браварская (злева) у ролі Юлечкі.

С. А. Пятровіч. Мінск.

БРАВЭРКА, на Беларусі старадаўні мужчынскі доўгі аднабортны пінжак з даматканага сукна. Пярэднія полкі цэльныя, мелі 2 праразныя і 2 накладныя кішэні. Спінка з падразной шырокай гесткай, са швом над гесткай і з хлясцікам. Каўнер і барты адкладныя. Рукаў прамы, завужаны ўнізе. У 19 — пач. 20 ст. была пашырана сярод заможных сялян, дробнай засцянковай шляхты. Пазней падобнае адзенне пад назвай марынарка шырока бытавала ў сялян Зах. Беларусі.


БРАГА, 1) адходы спіртавой прамысловасці, корм с.-г. жывёле. Атрымліваецца пры перапрацоўцы бульбы, збожжа, патакі. Мае 6—8% сухога рэчыва. У сырой бульбяной Б. 1,2% пратэіну, у аржаной — 1,7, кукурузнай — 2,7, патачнай — 2,1%. Кіслоты, якія ёсць у Б., нейтралізуюць мелам (50—60 *г* на 100 *л* Б.). Б. сушаць, сіласуюць, замарожваюць. Гл. таксама *Авоцістыя рэчывы корму.* 2) Старадаўні слабаалкагольны (1,5—3% алкаголю па масе) напітак усх. славян. Робяць з аржанага, ячменнага, прасянога соладу з цукрам, хмелем, часам з мёдам. Мае назву і бражка.

БРАГІ, вёска ў Трабскім с/с Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Сямігодка». За 34 *км* на ПнУ ад Іўя, 187 *км* ад Гродна, 3 *км* ад чыг. раз'езда Яхімаўшчына. 266 ж., дварoў 59 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

БРАГІН, гар. пас. (з 1938), цэнтр Брагінскага р-на Гомельскай вобл. На р. Брагінка, за 130 *км* на ПдЗ ад Гомеля, 28 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 6,7 тыс. ж. (1969).

Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1147 як горад Кіеўскага княства. Назва ад р. Брагінка. Лічаць, што старажытны Б. размяшчаўся на ўзвышшы правага берага Брагінкі. Гарадзішча вельмі пашкоджана ў час буд-ва на ім замка кн. *Вішнявецкіх.* З пач. 14 ст. ў складзе Вял. кн. Літоўскага, уласнасць вялікіх князёў. З канца 16 ст. рэзідэнцыя кн. Вішнявецкіх. Тут, пры двары Адама Вішнявецкага, у 1604 самазванец абвясціў сябе царэвічам Дзмітрыем І. Жыхары Б. актыўна ўдзельнічалі ў вызваленчай вайне украінскага і беларускага народаў 1648—54. У выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) далучаны да Рас. імперыі. Да Кастр. рэвалюцыі мястэчка Рэчыцкага пав. Мінскай губ.; паводле перапісу 1897 4,3 тыс. жыхароў. У 1918 у час ням. акупацыі ў Брагінскай вол. дзейнічалі партыз. атрады.

Хлебазавод, масласыразавод, камбінат быт. абслугоўвання, вінзавод, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Будуецца (1970) халадзільнік. 2 сярэднія, школа рабочай моладзі, муз. школа, Палац піянераў, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, паліклініка. Музей народнай славы. Помнікі У. І. Леніну, сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. На ПдЗ ад Б. выяўлена стаянка чалавека эпохі неаліту.



Брагін. Цэнтральная плошча.

БРАГІН Аляксей Фёдаравіч [14(27).3.1905, в. Бурцава Ніжагародскага пав.— 9.10.1941], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Вышэйшую школу партыйных арганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1940). З ліп. 1940 нам. загадчыка аддзела, з сак. 1941 сакратар Мінскага абкома КП(б)Б. У Айч. вайну займаўся стварэннем падпольных райкомаў КП(б)Б, арганізацый партыз. атрадаў у Мінскай і Палескай абл. У кастр. 1941 пры выкананні задання Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б па арганізацыі партыз. атрада схоплены гітлераўцамі каля пас. Чырвоная Палянка Любанскага р-на. Раненага Б. фашысты доўга катавалі на допыце ў в. Турок. Забіты пры спробе ўцячы. Яго імем названа партыз. брыгада, якая дзейнічала ў Мінскай вобл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалём. *Г. П. Купрэева.* Мінск.



БРАГІН Васіль Яфімавіч (н. 30.7.1920, в. Вялікая Рэчка Нікольскага пав. Валагодскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1947. Вызначыўся 23.6.1944 пры прарыве абароны праціўніка каля Віцебска, 29.6.1944 пры фарсіраванні р. Бярэзіны і ў баях за плацдарм, 9.7.1944 у баях на подступах да Вільнюса. Жыве на радзіме.


БРАГІНКА, рака ў Рэчыцкім і Брагінскім р-нах Гомельскай вобл. Каналы, якія адводзяць ваду з Б. ў Дняпро, дзеляць раку на 3 самастойныя водныя аб'екты. 1) Б. Верхняя — ад вытоку (на Пд ад в. Пракісель) да выхаду Дзярж. канавы і далей да ўпадзення ў Дняпро (даўж. 74 *км*, пл. вадазбору 1390 *км*²). 2) Б. Сярэдняя — ад выхаду Дзярж. канавы, за 2 *км* на Пд ад в. Гарадзішча, да выхаду канала Івераўка і далей да ўпадзення ў Дняпро (даўж. 55 *км*, пл. вадазбору 460 *км*²). 3) Б. Ніжняя — ад выхаду канала Івераўка (в. Марозаўка) да ўпадзення ў р. Прыпяць (у межах УССР), даўж. 50 *км*, пл. вадазбору 928 *км*². У вярхоўі шыр. даліны Б. 0,5—0,8 *км*. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады Б. Верхняй 4,44 *м*³/*сек*, Б. Сярэдняй 1,74 *м*³/*сек*, Б. Ніжняй 2,34 *м*³/*сек*. У разводдзе значная частка сцёку з Б. Верхняй падае ў Б. Сярэднюю і Б. Ніжнюю. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

БРАГІНСКІ Барыс Маркавіч (н. 17.1.1926, Кіеў), беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1969), праф. (1970). Чл. КПСС з 1967. У 1947 скончыў Кіеўскі мед. ін-т. З 1963 заг. кафедры факультэцкай тэрапіі Гродзенскага мед. ін-та. Асн. працы па клінічнай вітаміналогіі, паталогіі печані, атэрасклератычных пашкоджаннях сасудаў і сэрца.

Тв.: У зб.: Субтропические анемии (Таджикистана), Сталинабад, 1955; (разам з Ліхцыерам І. Б.) Нарушение обмена рибофлавина, фолиевой кислоты и витамина B_{12} при поражениях печени, у кн.: Современные данные по лечебному применению витаминов, М., 1960; у кн.: Материалы VI научной сессии ГГМИ и Всесоюзного симпозиума по тиамину, Мн., 1966.

БРАГІНСКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 1.9.1924. Размешчаны на ПдУ вобласці па даліне р. Брагінкі (прыток Прыпяці). Пл. 1,9 тыс. *км*². Нас. 56,6 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 18 сельсаветаў; 2 гар. пас.: Брагін — адм. ц. р-на, Камарын.

Паверхня раёна — слабахвалістая раўніна з раскіданымі невысокімі ўзгоркамі. Сярэдняя выш. 110—120 *м*. Пераважаюць азёрнарачныя і водналедавіковыя пясчаныя адклады, радзей пясчана-гліністыя. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу — 35,5 млн. *т* (у т. л. Паганянскае — 23,2 млн. *т*), цагельныя гліны. Сярэдняя т-ра студз. —6,3°, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 533 *мм* за год. Вегет. перыяд 196 дзён. Рэкі: Дняпро па У, на граніцы Б. р. з Чарнігаўскай вобл.; Брагінка (мае штучныя скіды ў Дняпро), яе найбольшы прыток Несвіч (правы). Рэкі выкарыстоўваюцца як водапрыёмнікі пры асушэнні балотаў і забалочаных зямель, на асобных участках Брагінка сплаўная. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (34,2%, у т. л. 10,8% аглееныя знізу), дзярнова-падзолістыл глеяватыя і глеевыя (12,1%), дзярнова-глеяватыя і глеевыя (16,8%), тарфяна-балотныя (36,0%)



і інш. З мінер. глебаў: 24,9% суглінкавых, 40,5 супясчаных, 34,6% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 46 (цана бала — 0,26 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 30, усіх с.-г. угоддзяў — 38. Лясы (пераважна мяшаныя) займаюць каля 26% тэр. Насельніцтва — беларусы, ёсць рускія, украінцы, яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. 30 чал. на 1 *км*². Гарадскога 17,6%.

Прамысл. прадпрыемствы перапрацоўваюць мясцовую с.-г. сыравіну. У Брагіне хлебазавод, масласырзавод, вінзавод, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, будуецца (1970) халадзільнік. Брагінскае торфапрадпрыемства. У Камарыне камбінат буд. матэрыялаў (цэгла, чарапіца), маслазавод, хлебапякарня, аддз. Сельгастэхнікі, лясгас. У Малейках крухмальны з-д. У раёне 22 калгасы і 7 саўгасаў (1970).


Калгасы і іх цэнтры: «XVIII партз'езд» *(Крыўча)*, імя Гагарына *(Дубліч)*, «Запаветы Леніна» *(Ясяні)*, імя Калініна *(Глухавічы)*, імя Кірава *(Кірава)*, імя Леніна *(Крукі)*, «Ленінскі шлях» *(Калыбань)*, «Ніжні Дняпровец» *(Ніжнія Жары)*, «Парыжская камуна» *(Шкураты)*, «Пераможнік» *(Малейкі)*, «Першамайск» *(Малажын)*, «Рухавік рэвалюцыі» *(Верхнія Жары)*, «Світанне» *(Чамярысы)*, «Сцяг Леніна» *(Зарэчча)*, імя Тэльмана *(Тэльмана)*, імя Фрунзе *(Асарэвічы)*, імя Чкалава *(Рудня-Журавлёва)*, «Чырвоная ніва» *(Буркі)*, «Чырвоная Украіна» *(Гдзень)*, «Чырвоны Кастрычнік» *(Мікулічы)*, «Шлях да камунізма» *(Сабалі)*, імя Энгельса *(Вуглы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Астрагляды» *(Астрагляды)*, «Брагінскі» *(Выграбная Слабада)*, «Камарынскі» *(Камарын)*, «Краснае» *(Краснае)*, «Пасудава» *(Залессе)*, «Піркі» *(Піркі)*, «Савічы» *(Савічы)*.



Пагрузка мінеральных угнаенняў для падкормкі пасеваў у саўгасе «Савічы».

С. гасп. спецыялізуецца на вытворчасці жыта, пшаніцы, бульбы, лёну і малочна-мясной прадукцыі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 57% тэр. раёна. Асушаюцца балоты і забалочаныя землі. Асушана 27,6 тыс. *га* (на пач. 1970). Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) 55,3, з іх збожжавыя і зернебабовыя (жыта, ячмень, лубін на зерне, авёс, пшаніца) займаюць 21,6, тэхнічныя 1,8 (у т. л. лён 1,7), бульба 9,6, кармавыя 21,8. На пач. 1970 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 59,1 (у т. л. кароў 26,6), свіней 34, авечак і коз 11,8. На Пд раёна чыгунка Чарнігаў — Оўруч; шаша Хойнікі — Брагін; будуюцца (1970) Брагін — Камарын і Брагін — Холмеч.

Малочнатаварная ферма ў калгасе «Шлях да камунізма».



У раёне (на пач. 1970) 22 сярэднія, 23 васьмігадовыя, 44 пачатковыя школы, школа рабочай і сельскай моладзі, 9 дашкольных устаноў, 44 клубныя ўстановы, 51 масавая б-ка, 58 кінаўстановак, у т. л. 45 стацыянарных, 9 бальнічных устаноў, 31 фельч.-ак. пункт. У 1970 у раёне працавала 447 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 14 інжынераў і эканамістаў, 27 аграномаў, 28 заатэхнікаў і вет. урачоў, 328 настаўнікаў, 37 урачоў і інш.; 1028 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Маяк Палесся».

С. А. Польскі. Мінск. вобл.

БРАДЖЭННЕ, працэс біялагічнага ператварэння рэчываў (пераважна вугляводаў) ад дзеяння ферментаў, што выпрацоўваюцца мікраарганізмамі. Акісляльна-ўзнаўленчы працэс, энергія якога ідзе на жыццядзейнасць мікраарганізмаў (бактэрый, грыбоў і інш.), Б. выкарыстоўваецца з даўніх часоў (прыгатаванне хлебнага цеста, малочнакіслых прадуктаў, віна). Вывучаць гэтую з'яву пачалі з сярэдзіны 17 ст. У 1837 Т. *Шван* даказаў, што глюкоза ператвараецца ў алкаголь і вуглякіслы газ ад дзеяння жывых дражджэй. Л. *Пастэр* каля 1860 выявіў пэўныя суадносіны паміж Б. і дыханнем і выказаў думку, што спіртавое Б.— своеасаблівая форма абмену рэчываў у бескіслародным асяроддзі. У 1897 ням. вучоны Э. Бухнер даказаў, што ажыццяўляць Б. могуць не толькі жывыя дрожджы, але і выцяжкі з іх. Методыку атрымання з дражджэй выцяжак, якія з'яўляюцца комплексам *ферментаў* і каталізуюць спіртавое Б., распрацаваў рус. вучоны А. М. Лебедзеў (1911). Было даказана, што працэс ператварэння глюкозы ў жывых арганізмаў *(гліколіз)* вельмі падобны да спіртавога Б. і ідзе з удзелам тых самых ферментаў. С. П. Костычаў, Я. А. Парнас (СССР), Г. Эмбдэн, О. Меергоф (Германія) высветлілі паслядоўнасць хім. рэакцый у Б. і распрацавалі метады вызначэння асобных стадый гліколізу. Розныя тыпы Б. называюць або па субстратах, што распадаюцца (пекцінавае Б., Б. клятчаткі), або па рэчывах, якія атрымліваюцца (спіртавое, малочнакіслае).

Малочнакіслае Б.— анаэробнае (гл. *Анаэробы*) ператварэнне вугляводаў з пераважным назапашваннем малочнай к-ты. Бывае тыповае — гомаферментацыйнае (прадукт — малочная к-та) і нетыповае — гетэраферментацыйнае (акрамя малочнай, утвараецца янтарная і воцатная к-ты, этылавы спірт і інш.). Тыповае малочнакіслае Б. выклікаюць бактэрыі Streptococcus lactis, St. diacetilactis, Lactobacillus Delbrückii, нетыповае — кішачная палачка Escherichia coli і інш. Малочнакіслае Б. выкарыстоўваюць у прыгатаванні сыраквашы, ацыдафіліну, кефіру, кумысу, малочнай к-ты, у хлебапякарстве, квашанні агародніны, сіласаванні кармоў.

Анаэробнае Б. клятчаткі мае вялікае біял. значэнне (разбурэнне раслінных рэштак, засваенне кармоў траваедным жывёламі, кругаварот вугляроду ў прыродзе). Даследаваў яго ў канцы 19 ст. В. Л. *Омелянскі*. Бактэрыі, што выклікаюць гэтае Б., наз. Bacillus Omelianski. Належаць клятчатковых бактэрый — паказчык акультураных глебаў.

Масленакіслае Б. выклікаюць бактэрыі роду Clostridium. Да гэтай групы належаць масленакіслае Б. вугляводаў, пекцінавых рэчываў, амінакіслот, клятчаткі, ацэтонабутылавае Б. Масленакіслае Б. вугляводаў уласцівае анаэробным бактэрыям Cl. Pasteurianum, Cl. butyricum і інш. Пры ім распадаюцца арган. рэчывы (вугляводы, спірты) і атрымліваюцца масленая і воцатная к-ты, вадарод, вуглякіслата. У харч. прамысловасці і ў быце шкоднае (псуе кашаную агародніну, сыры, кансервы); у прыродзе пашырана і мае вялікае значэнне ў кругавароце вугляроду.

Ацэтонабутылавае Б. выклікаецца Cl. acetobutilicum. Працэс мае 2 фазы: спачатку растуць клеткі бактэрый і назапашваюцца масленая і воцатная к-ты; pH асяроддзя 3,9; пасля клеткі аўталізуюцца, кіслотнасць змяншаецца, назапашваецца ацэтон, бутылавы і этылавы спірты. Зменай умоў можна заглушыць першую ці другую фазу і атрымаць патрэбныя рэчывы. У прамысл. праз ацэтонабутылавае Б. атрымліваюць ацэтон і бутылавы спірт з крухмалістай сыравіны (зярнят і катахоў кукурузы, качаноў капусты, гідралізатаў драўніны і інш.).

Масленакіслае Б. пекцінавых рэчываў, утвораных пры гідролізе пекціну, што склейвае раслінныя клеткі, выклікаецца бактэрыямі Granulobacter pectinovorum. Выкарыстоўваецца пры вымочванні валакністых раслін (лёну, канапель, джуту).

Да асобнай групы належыць масленакіслае Б. бялкоў, пры якім распадаюцца амінакіслоты, утораныя гідролізам бялкоў у анаэробных умовах. Гэтае Б. выклікаюць сапрафіты Cl. putrificum і інш., а таксама патагенныя бактэрыі: Cl. welchii (узбуджальнік газавай гангрэны) і Cl. botulinum (утварае яд батулін).

Метанавае Б., якое выклікаюць многія бактэрыі, бывае ў балоцістых месцах, а таксама ў адстойніках сцёкавых водаў. Часам утвараецца столькі метану, што яго можна выкарыстоўваць як паліва. Некат. штамы бактэрый метанавага Б. выкарыстоўваюцца для атрымання канцэнтратаў вітаміну B_{12}.

Найбольш вывучана спіртавое Б. Яго выклікаюць дрожджы роду Saccharomyces, а таксама некат. бактэрыі і асобныя мукоравыя грыбы. Пры гэтым з вугляводаў (мона- і дыцукрыдаў) утвараюцца этылавы спірт і вуглякіслата. Спіртавое Б. выкарыстоўваецца ў вытв. віна, спірту, піва, у прыгатаванні хлебнага цеста.

Усе названыя тыпы Б. анаэробныя (масленакіслыя) і факультатыўна-анаэробныя (спіртавое, малочнакіслае). Ёсць і т. зв. акісляльнае Б., пры якім анаэробны распад вугляводаў ідзе толькі да ўтварэння піравінаграднай к-ты, далей акісленне адбываецца з удзелам свабоднага кіслароду. Гэта лімоннакіслае, воцатнакіслае і інш. віды Б. Лімоннакіслае выклікаецца плесневым грыбком Aspergillus niger. Утвараецца лімонная к-та, якую выкарыстоўваюць у харч. прамысловасці. Воцатнакіслае Б. этылавага спірту выклікаюць бактэрыі Acetobacter Pasteurianum, Ac. aceti і інш. Яго выкарыстоўваюць для атрымання воцту (з віна-граднага ці інш. пладовага вінаматэрыялу, а найчасцей — з разведзенага спірту).

Літ.: Омелянский В. Л. Избранные труды, т. 2, М., 1953; Федоров М. В. Микробиология, 7 изд., М., 1963; Барнет А. Процессы брожения в силосе, пер. с англ., М., 1955; Пастер Л. Исследования о брожениях, пер. с франц., М.—Л., 1937; Прескот С. и Дэн С. Техническая микробиология, пер. с англ., М., 1952; Фробишер М. Основы микробиологии, пер. с англ., М., 1965.

М. Ф. Мяражынскі. Мінск.

БРАДЗЕЦ, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., на р. Бярэзіне (прыток Дняпра). Цэнтр сельсавета і калгаса «Бярэзіна». За 25 *км* на Пд ад Бераэіна, 128 *км* ад Мінска. 574 ж., двароў 181 (1970). Лясніцтва, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет.-заатэхнічны ўчастак, бальніца, аддз. сувязі, магазін. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. акупанты спалілі вёску, загубілі 195 жыхароў. 2 брацкія магілы сав. воінаў і партызанаў. На левым беразе Бярэзіны, за 0,4 *км* на Пн ад Б., знойдзена стаянка неаліту і паселішча ранняга жалезнага веку.


БРАДЗІХІН Фёдар Аляксандравіч [26.11 (8.12). 1831, г. Мікалаеў Херсонскай губ.— 1(14).5.1904], рускі астраном. Акад. Пецярбургскай АН (1890), праф. Маскоўскага ун-та (1865), ганаровы чл. многіх айч. і заруб. навук. т-ваў і ўстаноў. Дырэктар Маскоўскай абсерваторыі з 1873, Пулкаўскай у 1890—95. Навук. працы ў галіне астрафізікі, астраметрыі, гравіметрыі. Сусв. значэнне маюць даследаванні камет і метэораў. Стварыў мех. тэорыю каметных формаў, абгрунтаваўшы ўтварэнне хвастоў каметы в часцінак яе ядра і іх рух ад дзеяння адштурхных сіл сонечнага святла (гл. *Ціск святла*) і сонечнага прыцяжэння. Даследаваў утварэнне перыядычных камет і паходжанне метэораў. Заснаваў першую рус. астрафіз. школу. У 1946 Прэзідыум АН СССР устанавіў прэмію імя Б. за працы ў галіне астраноміі.



Тв.: Этюды о метеорах, М., 1954.

Літ.: Федор Александрович Бредихин. 1831—1904, М., 1948 (бібліягр.); Невская Н. И. Федор Александрович Бредихин. 1831—1904, М.— Л., 1964.

БРАДНІК, сетка тыпу невада для лоўлі рыбы на мелкаводдзі. Конусападобная карма (матня) з двума крыламі прымацавана да двух калкоў. Даўжыня Б. (шырыня захопу) 6—12 *м*, вышыня 1,5 *м*.



БРАДЫ, вёска ў Мсціжскім с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Прыстань на р. Бярэзіна (прыток Дняпра). За 73 *км* на ПнЗ ад Барысава, 150 *км* ад Мінска. 324 ж., двароў 88 (1970). Сплаўны ўчастак Плешчаніцкага леспрамгаса. Пач. школа, фельч.-ак. пункт.

БРАДЫ, вёска ў Шчарчоўскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Лясная Лева. Цэнтр калгаса «Ленінскі камсамол». За 30 *км* на ПдЗ ад Пружан, 70 *км* ад Брэста, 45 *км* ад чыг. ст. Аранчыцы. 398 ж., гасп. 131 (1970). Сярэдняя школа, Дом культуры, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны, швейная майстэрня. У часы бурж. Польшчы ў Б. дзейнічалі падпольныя ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БРАЖНІК Леанід Фёдаравіч [н. 4(17).4. 1917, в. Маскаленкі Сумскага пав. Харкаў-

скай губ.], беларускі савецкі спявак (бас). Нар. арт. БССР (1959). У 1955 скончыў Муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (Масква). З 1952 саліст Бел. т-ра оперы і балета. Партыі: Даніла, Аніщчук («Дзяўчына з Палесся» і «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага), Дураў («Надзея Дурава» А. Багатырова), Якуб («Марынка» Р. Пукста), Гадлеўскі («Яснае світанне» А. Туранкова), Мельнік («Русалка» А. Даргамыжскага), Грэміп («Яўген Анегін» П. Чайкоўскага), Галіцкі («Князь Ігар» А. Барадзіна), Пімен, Варлам («Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага), Мефістофель («Фаўст» Ш. Гуно), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні) і інш. Б. ўласцівыя майстэрства пераўвасаблення, натуральнасць сцэнічных паводзін, завершанасць пластычнага малюнка вобраза. Валодае разнастайным камерным рэпертуа-







Л. Ф. Бражнік у ролях Мефістофеля (злева) і Мельніка.

рам. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу на лепшае выкананне вак. твораў Мусаргскага (1956). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Г. М. Загародні.

БРАЖНІКІ (Sphingidae), сям. вялікіх матылёў. Маюць тоўстае верацёнападобнае цела, вузкія пярэднія крыльцы і параўнальна кароткія заднія, доўгі хабаток, тоўстыя роўныя вусікі. Палёт Б. моцны і хуткі. Большасць відаў актыўныя на змярканні, хобатнікі лятаюць удзень. Смокчуць нектар кветак, не прысядаючы на расліны. Вусені Б. вялікія, голыя, з своеасаблівым ражком на задняй частцы брушка. Кукалкі жывуць у глебе. У СССР каля 50 відаў. Ёсць шкоднікі вінаграду, тэхн. культур, дрэвавых раслін. Б. мёртвая галава (Acherontia atropos) часта жывіцца мёдам у вуллях, вусені матыля аб'ядаюць лісце бульбы.

Бружмелевая чмеля-відка і яе вусень.



БРАЗАВІЛЬ (Brazzaville), сталіца Народнай Рэспублікі Конга, на правым (паўн.) беразе р. Конга, насупраць Кіншасы. Чыг. ст., рачны порт, вузел шашэйных дарог. Міжнар. аэрапорт. 160 тыс. ж. (1965). Ф-кі прадзільна-ткацкая і гатовага адзення, запалкавая і цыгарэтная, піўзавод, цагельня, пільні, прадпрыемствы для перапрацоўкі харчовых прадуктаў, механічныя майстэрні. Саматужныя промыслы: разьба па дрэве, маст. кераміка. Універсітэт. Інстытуты: цэнтральнаафрыканскіх даследаванняў, геаграфічны, Пастэраўскі.

БРАЗДЗЕТЧЫНА, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ленінскі шлях». За 22 *км* на ПдУ ад Оршы, 102 *км* ад Віцебска, каля шашы Орша — Горкі (2 *км*). 143 ж., двароў 53 (1970). Сярэдняя школа, клуб, мед. пункт. На брацкай магіле помнік сав. воінам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БРАЗДЗЕЦКАЯ СЛАБАДА, вёска ў Цяпінскім с/с Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Ула. Цэнтр калгаса імя Будзённага. За 3 *км* на ПпУ ад Чашнікаў, 98 *км* ад Віцебска, 6 *км* ад чыг. ст. Чашнікі. 127 ж., двароў 42 (1970). Пач. школа.

БРАЗЕР Абрам Маркавіч (1892, Кішынёў — 1942), беларускі савецкі скульптар, жывапісец і графік. Засл. дз. маст. БССР (1940). Вучыўся ў маст. вучылішчах Адэсы і Кішынёва (да 1910), у Парыжскай акадэміі мастацтваў (1912—14). Удзельнік выставак: «Асенні салон» у Парыжы (1913), «Свет мастацтва» ў Петраградзе (1916). У 1918—23 працаваў у Віцебскай нар. маст. школе (з 1920 Дзярж. маст. майстэрня), потым у Мінску. Быў чл. Усебеларускага аб'яднання мастакоў і Рэвалюц. арг-цыі мастакоў Беларусі. Вызначаюцца скульптурныя партрэты Ю. Пэна (1921), С. Міхоэлса (1935), партрэт народнага настаўніка М. Б. Голуба (1940), статуя С. М. Кірава (1937—40), партрэт С. К. Цімашэнкі (пастэль, да 1935).



А. М. Бразер. Народны настаўнік М. Б. Голуб. Гіпс. 1940.

БРАЗІЛІЯ (Brasil), Рэспубліка Бразілія, дзяржава ва ўсх. частцы Паўд. Амерыкі. Пл. 8513 тыс. км² (5-е месца ў свеце). Нас. 93,2 млн. чал. (1969). Сталіца г. Бразілія. Падзяляецца на 22 штаты, 4 федэральныя тэр. і 1 федэральную (сталічную) акругу. Паводле прыродных, гістар. і эканам. асаблівасцей яны аб'ядноўваюцца ў 5 груп: 1) ПнУ — штаты Мараньян, Піауі, Сеара, Рыу-Гранды-ду-Норты, Параіба, Пернамбуку, Алагоас, Сержыпі, Баія, тэрыторыя — а-вы Фернанду-ды-Наронья; 2) ПдУ — штаты Мінас-Жэрайс, Эспірыту-Санту, Рыо-дэ-Жанейра, Сан-Паўлу, Гуанабара; 3) Пд — штаты Парана, Санта-Катарына, Рыу-Гранды-ду-Сул; 4) Пн — штаты Амазонка, Пара, Акры, тэр. Амапа, Рандонія, Рарайма; 5) З — штаты Мату-Гросу і Гаяс. Карту гл. на ўкл.




Дзяржаўны лад. Б.— федэратыўная рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя, прынятая ў кастр. 1969. На чале дзяржавы і ўрада стаіць прэзідэнт, які выбіраецца на 5 гадоў. Заканадаўчая ўлада ажыццяўляецца дзвюхпалатным Нац. кангрэсам, але прэзідэнт мае права выдаваць законы, накладаць вета на законапраекты і карыстацца інш. паўнамоцтвамі. Нац. кангрэс складаецца з 2 палат: палаты дэпутатаў і федэральнага сената. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе прэзідэнт. Штаты маюць свае канстытуцыі і заканадаўчыя сходы. На чале штатаў стаяць губернатары. Судовая сістэма: Вярх. федэральны суд, федэральныя апеляцыйныя суды, ваен. трыбуналы, суды штатаў.

Прырода. Паўн. частку Б. займаюць адгор'і Гвіянскага нагор'я; на Пд яно пераходзіць у Амазонскую нізіну, рэльеф якой вельмі плоскі. На З шырыня яе 1300 *км*, на У — 350 *км*. Далей на Пд вялізнае Бразільскае нагор'е, яно паступова павышаецца на ПдУ (г. Бандэйра, выш. 2890 *м*) і стромка абрываецца да вузкай узбярэжнай нізіны Атлантычнага ак. Цэнтр. і зах. часткам Бразільскага нагор'я характэрны асобныя сталовыя пясчанікавыя плато «шапады» са стромкімі схіламі (плато Мату-Гросу, Сера-дус-Парэсіс, Сера-ду-Кашымбу), усх. частка ўтворана глыбавымі крышталічнымі масівамі (Сера-ду-Мар і інш.). Б. багатая на карысныя выкапні: запасы жал. руды 80 млрд. *т*, каменнага вугалю 1,2 млрд. *т*, марганцавай руды 66 млн. *т*, баксітаў 192 млн. *т*, хромавай руды 5 млн. *т*, медзі 40 млн. *т*, фасфарытаў 140 млн. *т*. Ёсць радовішчы нафты, урану, рэдкіх і каляровых металаў, прамысл. алмазаў. Клімат Амазонскай нізіны і часткова Гвіянскага нагор'я экватарыяльны, гарачы і вільготны. На большай ч. Бразільскага нагор'я трапічны, з дажджлівым летам і сухой зімой. Сярэдняя т-ра студз. 23—28, ліп. 17—24 °С, ападкаў 1500—2000 *мм* за год. На ПпУ Б. «палігон засухі», дзе ападкаў выпадае 700—1000 *мм* за год і колькасць іх вельмі вагаецца з году ў год. На У і ПдУ ўзбярэжжа і на Пд субтрапічны вільготны клімат, ападкі выпадаюць раўнамерна. Найбольшая рака Амазонка. 18 яе прытокаў маюць даўж. больш за 1500 *км* кожны. Самыя значныя Рыу-Негру, Мадэйра, Тапажос. На З і Пд рэкі Парана, Парагвай, Уругвай, на У і ПнУ Сан-Франсіску, Такантынс. Ва ўпадзіне Парагвая велізарныя балоты Пантанал. Патэнцыяльныя гідраэнергетычныя рэсурсы краіны 21 млн. *кВт*. Глебы трапічнага і экватарыяльнага тыпу, латэрытныя: на У і ў бас. Амазонкі ападзоленыя, на нагор'ях чырвоныя і чырвона-карычневыя, на Пд жаўтаземы і чырвона-чорныя. Уздоўж рэк глебы алювіяльныя. Лесам укрыта 56,7% тэрыторыі Б. На Пн краіны найбольшы ў свеце масіў вечназялёных экватарыяльных лясоў (гілея). На Бразільскім нагор'і палоса стэпаў і саванаў (кампас) увільготненых травяных або з засухаўстойлівымі дрэвамі (каатынга). На Пд Б. субтрапічная раслінасць, пераважна араўкарыевыя лясы. Жывёльны свет мала зменены чалавекам. Ёсць ягуары, тапіры, малпы, мурашкаеды, ляніўцы, браняносцы, змеі. З птушак найбольш вядомыя каліброві. Шмат насякомых.

Насельніцтва. Большасць бразільцы — нацыя, якая ўтварылася ад змяшання еўрапейцаў (да пач. 20 ст. пераважна партугальцаў), неграў-рабоў і карэнных жыхароў (індзейцаў). Негры складаюць 11%, метысы, мулаты, індзейцы 26%. З пач. 20 ст. вымерла 87 плямёнаў індзейцаў, асталося 143, з іх 33 ізалявана жывуць у глыбіні лясоў. На Пд і ў прыморскіх гарадах групы імігрантаў з Італіі, Германіі, Іспаніі, Партугаліі, Японіі. Дзярж. мова партугальская, рэлігія каталіцкая. Гарадскога нас. 46% (1965). Найбольшыя гарады (тыс. ж., 1968): Сан-Паўлу (5685), Рыо-дэ-Жанейра (4207), Белу-Арызонты (1167), Рэсіфі (1100), Порту-Алегры (933), Салвадор (898), Фарталеза (846), Курытыба (617), Белен (571), Бразілія (390).

Рыо-дэ-Жанейра. На заднім плане гара Цукровая Галава.




Гістарычны нарыс. Паводле археал. звестак тэр. сучаснай Б. чалавек насяляў яшчэ ў эпоху неаліту. Да 16 ст. індзейскія плямёны жылі абшчынамі, займаліся рыбалоўствам, паляваннем, земляробствам. У 1500 партуг. мараплавец Педру Алварыш Кабрал назваў адкрытую ім Б. «Зямлёй святога крыжа» і абвясціў яе ўладаннем партуг. караля. У працэсе каланізацыі партугальцы занявольвалі індзейцаў, прымушалі іх выконваць цяжкія работы па нарыхтоўцы чырвонага дрэва «пау-браэіл» (адсюль назва Бразілія). На каланізаваных землях паступова ўзнікалі феад. ўладанні з прыгоннікай і рабскай працай. Нястача рабочых рук вымушала каланістаў прывозіць неграў-рабоў з Афрыкі. Рабы нярэдка паўставалі супраць уладальнікаў латыфундый. У 1630 збеглыя негры стварылі самастойную дзяржаву Пал-

марыс (знішчана ў 1697). Палітыка партуг. улад стрымлівала эканам. развіццё Б. (забарона суднабудавання, мануфактур, кнігадрукавання, абмежаванне гандлю і гаспадарак каланістаў-бразільцаў, падаткі з калоніі), была прычынай незадаволенасці ўсіх колаў браз. насельніцтва. Пасля акупацыі (1807) Партугаліі напалеонаўскай арміяй партуг. каралеўскі двор пераехаў у Б. Утрыманне двара патрабавала вялікіх сродкаў, прывяло да павелічэння падаткаў, што таксама выклікала пратэст. Паўстанне 1817 ахапіла Пернамбуку, дзе была створана рэспубліка, Сеару, Параібу, Мараньян, Алагоас. Пад уплывам партуг. бурж. рэвалюцыі 1820 вызв. рух у Б. ўзмацніўся. Кароль Жуан VI пакінуў Б. і перадаў трон сыну Педру I (1822—31). Апошні вымушаны быў абвясціць (1822) Б. незалежнай імперыяй (Партугалія прызнала незалежнасць Б. ў 1825). Нар. масы не спынялі барацьбы за дэмакр. рэспубліку і адмену рабства. Адбыліся паўстанні рабоў 1824—30 у правінцыі Баія, нар.-рэсп. паўстанне 1831 у Рыо-дэ-Жанейра. У выніку паўстання «Сабінада» 1837—38 гарадскі плебс Баіі абвясціў рэспубліку. У Піауі і Мараньяне на барацьбу ўзняліся кашолачнікі («балаяды»), дробныя жывёлаводы, індзейцы, негры-рабы. У 1835—45 пашырыўся рух «фарапус» — абадранцаў (марскімі сіламі іх камандаваў Дж. *Гарыбальдзі*), у 1848—49 «праейрус» — жыхароў узбярэжжа. Дэмакр. рэспубліка «фарапус» праіснавала некалькі гадоў. Рух за свабодную працу і антыманарх. выступленні з новай сілай выбухнулі ў 80-я г. 19 ст. Пад іх націскам у 1888 выдадзены т. зв. «Залаты закон» пра адмену рабства. Напалоханыя рэвалюц. рухам нар. мас прадстаўнікі ліберальных памешчыкаў і арміі зрабілі пераварот. Педру II быў скінуты, 15.11.1889 Б. абвешчана федэратыўнай рэспублікай, у 1891 прынята канстытуцыя. Гэта спрыяла бурж. развіццю краіны. Аднак характар аграрных адносін (паўфеад. залежнасць неграў і імігрантаў-каланістаў ад землеўладальнікаў), пранікненне ў эканоміку Б. замежнага, пераважна англ., капіталу стрымлівалі развіццё нац. прадукцыйных сіл. У 1910 Б. ўвайшла ў Панамерыканскі саюз. ЗША сталі асн. канкурэнтамі зах. дзяржаў у завалоданні гал. галінамі браз. эканомікі.

У канцы 19 — пач. 20 ст. ў краіне ўзнікаюць першыя рабочыя арг-цыі (1892 — «Сацыялістычны цэнтр» у г. Сантусе, 1896 — гурткі сацыялістаў аб'ядналіся ў Сацыяліст. партыю). Пад іх кіраўніцтвам прайшлі забастоўкі і рабочыя дэманстрацыі (1905—07). У 1-ю сусв. вайну Б. далучылася (1917) да краін Антанты. Аслабленне ў гэты перыяд эканам. сувязей з Англіяй спрыяла развіццю браз. прамысловасці, росту рабочага класа, нац. буржуазіі. Завяршылася ў асноўным фарміраванне браз. нацыі.

Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыя выклікала ўздым рабочага руху ў Б. У 1918—21 ствараюцца марксісцкія групы, у сак. 1922 засн. кампартыя Б. (КПБ). У 1922 паўстаў сталічны гарнізон, у 1924 — гарнізон у Сан-Паўлу. Масавыя выступленні народа ахапілі мно-

Рыо-дэ-Жанейра. Гарадскія трушчобы.




гія штаты. Атрады паўстанцаў поўдня Б. пад камандаваннем афіцэра Луіса Карласа *Прэстэса* з баямі прайшлі (кастр. 1924 — люты 1927) амаль праз усю краіну (інтэрніраваны ў Балівіі). Сусв. эканам. крызіс 1929—33 яшчэ больш абвастрыў класавыя супярэчнасці. У 1931 Б. пацярпела фін. банкруцтва. Барацьбу за ўладу пачалі 2 паліт. групоўкі: Ліберальны альянс на чале з прадстаўнікамі буржуазіі і звязаных з ёю буйных латыфундыстаў і Кансерватыўная канцэнтрацыя на чале з прадстаўнікамі памешчыцкіх колаў. Узбр. барацьба скончылася перамогай Ліберальнага альянсу. Яго лідэр Ж. Варгас сфарміраваў 3.11.1930 часовы ўрад. Але ўнутраная вайна не скончылася. У ліп. 1932 узбр. барацьба аднавілася. Нягледзячы на перамогу, Варгас пайшоў на паліт. кампраміс з памешчыцкімі коламі. Канстытуцыя 1934 і дадаткі да яе абвяшчалі 8-гадзінны рабочы дзень, выбарчае права жанчынам і г. д., але канстытуцыйныя прынцыпы амаль не ажыццяўляліся. У краіне актывізавалася створаная ў 1933 фаш. партыя. Антыфаш. сілы аб'ядналіся (1935) у Нац.-вызв. альянс, павялі рашучую барацьбу з рэакцыяй. Узбр. паўстанні адбыліся ў Рыо-дэ-Жанейра, Рэсіфі, Натале і інш. Усе яны бязлітасна задушаны. Пасля дзярж. перавароту 1937 Варгас развагнаў кангрэс, абнародаваў новую канстытуцыю, абвясціў сябе заснавальнікам «новай дзяржавы справядлівасці», прыхільнікам трабалызму («абароны працоўных») і антыімперыялізму, пайшоў на некат. ўступкі рабочым, што шырока выкарыстоўвалася для прапаганды т. зв. новай эры ў гісторыі Б. 27.1.1942 Б. спыніла дыпламат. адносіны з краінамі «восі», 22.8. 1942 абвясціла вайну Германіі і Італіі, 6.6. 1945 — Японіі. Пад уплывам перамог над фаш. дзяржавамі ў 2-й сусв. вайне дэмакр. рух у Б. ўзмацніўся. У 1945 дазволена дзейнасць паліт. партый, устаноўлены дыпламат. адносіны з СССР. З 1945 Б. член ААН. 29.10. 1945 адбыўся ваен. пераварот. Аднак нар. масы сарвалі намер рэакц. сіл устанавіць ваен. дыктатуру. На прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах 10% галасоў атрымалі камуністы. Канстытуцыя 1946 замацавала некат. дэмакр. заваёвы працоўных. Але ўжо ў крас.— маі 1947 урад ген. Дутры забараніў дзейнасць КПБ, Саюза камуніст. моладзі (засн. ў 1943) і Канфедэрацыі працоўных (засн. ў 1946). У знешняй палітыцы новы ўрад прытрымліваўся курсу ЗША, у кастр. 1947 спыніў дыпламат. адносіны з СССР. Усё гэта выклікала незадаволенасць у краіне. У выніку нацыяналіст. руху да ўлады зноў прыйшоў (1951) урад Варгаса. У 1953 створана нац. нафтавая манаполія «Петрабраз», у 1954 унесены праект пра стварэнне дзярж. кампаніі «Электрабраз», выдадзены дэкрэт пра павышэнне ўдвая зарплаты рабочым і служачым. Ажыццяўленне дэкрэта ўзмацніла супраціўленне рэакцыі. Варгас скончыў жыццё самагубствам (жн. 1954). Спроба рэакц. ваеншчыны ўстанавіць рэжым дыктатуры была сарвана. У выніку барацьбы

пар. мас на прэзідэнцкіх выбарах 1955 перамог кандыдат бурж. С.-д. партыі Ж. Кубічак. Але ў яго ўрад увайшлі і прадстаўнікі рэакц. колаў, якія сталі на шлях далейшага падпарадкавання эканомікі краіны манаполіям ЗША. Урад Ж. Куадраса, сфарміраваны ў 1961 з прадстаўнікоў бурж. партый — Нац.-дэмакр. саюза і Хрысціянска-дэмакр. партыі, расшырыў эканам. сувязі з СССР і інш. сацыяліст. краінамі, устанавіў дыпламат. адносіны з Балгарыяй, Венгрыяй, Румыніяй, не без сімпатый сачыў за антыімперыяліст. барацьбой кубінскага народа. Пасля адстаўкі Куадраса (з-за змовы рэакцыі) разгарнуўся масавы рух супраць праамерыканскай палітыкі, якую праводзілі рэакц. колы. У выніку барацьбы нар. мас пасаду прэзідэнта заняў у адпаведнасці з канстытуцыяй віцэ-прэзідэнт Ж. Гуларт. 23.11.1961 адноўлены дыпламат. адносіны з СССР. Працоўныя дамагліся павышэння мінімуму зарплаты, абмежавання вываду прыбыткаў замежнымі манаполіямі, частковай нацыяналізацыі памешчыцкіх зямель. Супраць знешняй і ўнутранай палітыкі ўрада Гуларта выступілі рэакц. сілы. Пасля ваен. перавароту 1.4.1964 часовым прэзідэнтам стаў ген. У. Кастэла Бранка. Законы ўрада Гуларта былі скасаваны, забаронены паліт. забастоўкі, дзейнасць шэрагу прафсаюзаў, многія дэпутаты кангрэсу пазбаўлены мандатаў, а прагрэс. грамадскія дзеячы — паліт. правоў. У кастр. 1965 распушчаны ўсе партыі. 3.10.1966 Нац. кангрэс выбраў прэзідэнтам А. да Коста-э-Сілву (заступіў на пасаду ў сак. 1967). У студз. 1967 прынята новая канстытуцыя, якая расшырыла паўнамоцтвы прэзідэнта, устанавіла жорсткія ўмовы для стварэння новых партый. У лют. 1967 зацверджаны закон пра друк (суровае пакаранне выдаўцоў і журналістаў за надрукаванне «падрыўных» матэрыялаў), у сак. 1967 — пра нац. бяспеку (строгі кантроль за паліт. дзейнасцю брав. грамадзян). З 13.12. 1968 дзейнічае інстытуцыйны акт № 5, які дае права прэзідэнту распускаць кангрэс, адхіляць ад работы і ссылаць дзярж. і паліт. дзеячаў. Паводле яго ў снеж. 1968 на нявызначаны тэрмін распушчаны Нац. кангрэс, арыштавана шмат паліт. дзеячаў і журналістаў. Урад адмяніў абмежаванні на вываз прыбыткаў замежнымі манаполіямі. Заключана пагадненне з ЗША пра гарантыі амер. прыватнаму капіталу. У кастр. 1969 вярхоўнае камандаванне ўзбр. сіл абвясціла аб прызначэнні прэзідэнтам замест хворага А. да Коста-э-Сілвы (п. 17.12.1969) ген. Эміліу Гарастазу Медысі. З 30.10.1969 уведзена новая канстытуцыя. Яна прадугледжвае пакаранне смерцю за «падрыўную дзейнасць». Нягледзячы на рэпрэсіі, у краіне расце пратэст супраць антыдэмакр. палітыкі ўрада.


Палітычныя партыі і прафсаюзы. Нацыянальны саюз абнаўлення, правячая партыя. Браэільскі дэмакратычны рух, правая апазіцыйная партыя. *Браэільская камуністычная партыя* ў падполлі. Ген. сакратар ЦК Л. К. Прэстэс. Дзейнасць прафсаюзаў абмежавана, кантралюецца ўрадам, ім забаронена ўваходзіць у міжнар. прафсаюзныя аб'яднанні.

Гаспадарка. Б.— аграрна-індустр. краіна. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні экспартных культур. Нягледзячы на вял. прыродныя багацці (паводле звестак ААН Б. здольна пракарміць 1,2 млрд. чал.), Б.— краіна з параўнаўча слабаразвітай эканомікай.




Прамыўка танталавай руды. Штат Параіба.


У 1967 замежных укладанняў у эканоміку было 4 млрд. дол., у т. л. ЗША — 2,2. Асн. доля ў гаспадарцы падае на вырошчванне кавы (каля 50% сусв. вытворчасці), якая дае 50—60% экспартных даходаў краіны. У с. гасп. занята 51,7% (1967) самадзейнага нас. Памешчыкі-латыфундысты (1% усіх землеўладальнікаў) валодаюць 47,2% плошчы с.-г. зямель. 45% інш. гаспадарак валодае 2,2% зямлі. Збор галоўных с.-г. культур у 1967 (тыс. *т*): кавы 1380, бавоўны 612, пшаніцы 365, кукурузы 12 452, рысу 6700, фасолі 1200, маніёку 21 000, баваўнянага семя 1900. Вырошчваюць какаву, арахіс, бульбу, цукр. трыснёг, сою, сізаль, цыбулю, джут. Плантацыі кавы пераважна ў штаце Сан-Паўлу і суседніх раёнах. Кукуруза, маніёк і фасоля — гал. харч. культуры. Першыя дзве вырошчваюцца па ўсёй краіне, фасоля ў штатах Парана і Мінас-Жэрайс. На Пд значныя плошчы пшаніцы. Раён пасеваў рысу — штат Рыу-Гранды-ду-Сул. Плантацыі какавы на ўзбярэжжы штата Баія. Бавоўнік на ПдУ. Арахіс у штатах Сан-Паўлу і Парана. Бульба на Пд. Вельмі пашырана вырошчванне бананаў, апельсінаў, ананасаў, авакада, манга і інш. Бананы экспартуюць штаты Санта-Катарына, Парана, Сан-Паўлу; апельсіны — Рыо-дэ-Жанейра, Сан-Паўлу, Мінас-Жэрайс. Жывёлагадоўля мяснога кірунку. У 1968 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 89,9, свіней 63, авечак 23; у 1967 — коз 9, мулаў 5, аслоў 2,8. Асн. раёны жывёлагадоўлі ва ўнутр. ч. Бразільскага нагор'я і на Пд. Прамысл. развіваецца даволі хутка, асабліва металургічная, аўтамабільная, трактарная, нафтахімія, суднабудаванне. Больш за ¾ усёй прамысл. прадукцыі даюць штаты Сан-




Паўлу, Гуанабара і Рыо-дэ-Жанейра. Найбольш старая галіна прамысл. горназдабываючая. У 1967 здабыта (тыс. *т*): кам. вугалю 1957, жал. руды 15 163 (па ўтрыманні Fe), марганцавай руды 598 (па ўтрыманні металу), нафты 6994, хромавай руды 5,7 (па ўтрыманні Cr_2O_3), баксітаў 303. Здабываюцца вальфрам, берылій, цырконій, гафній, ніобій, слюда, уран, золата, алмазы, горны крышталь. Энерг. база прамысл.— ГЭС на рэках Бразільскага нагор'я. Найбольшыя: Фурнас (1200 тыс. *квт*) на р. Рыу-Гранды, Паўлу-Афонсу (570 тыс. *квт*) на р. Сан-Франсіску. Будуюцца (1969) на р. Парана ГЭС Ілья-Салтэйра (3,2 млн. *квт*) і Жупія (1,4 млн. *квт*) і інш. На Пд і ў гарадах уэбярэжжа ЦЭС. У 1967 выпрацавана эл. энергіі 34,2 млрд. *квт·гадз.* Важнае значэнне мае выкарыстанне лясных багаццяў (каштоўная драўніна, каўчук, какосавыя арэхі). На харч. і тэкст. прамысловасць прыпадае больш за ⅓ кошту ўсёй апрацоўчай прамысл. Штаты Сан-Паўлу, Рыу-Гранды-ду-Сул, Парана, Мінас-Жэрайс, Рыо-дэ-Жанейра, Пернамбуку, Гуанабара даюць больш за 90% прадукцыі. Развіта першасная апрацоўка кавы і інш. с.-г. прадуктаў. Малочная, масла-



БРОНЗАВЫ ВЕК (II тысячагоддзе да н.э.)





Нафтаперапрацоўчы завод у Салвадоры.

робчая, мукамольная прамысл. Асн. галіна тэкст. прамысловасці — бавоўняная вытворчасць (штаты Сан-Паўлу, Мінас-Жэрайс, Пернамбуку). Прамысл. швейная, шарсцяная (штат Рыу-Гранды-ду-Сул), джутавая, натуральнага і штучнага шоўку. Развіта нафтаперапр. прамысл. Найбольшыя з-ды ў Рыо-дэ-Жанейра, Сан-Паўлу, Сантусе, Порту-Алегры, Белу-Арызонты. У Рыо-дэ-Жанейра з-д сінт. каўчуку. Па развіцці чорнай металургіі Б. займае 1-е месца сярод краін Лац. Амерыкі (важныя цэнтры Волта-Рэдонда, Белу-Арызонты, Жуан-Манлевады). У 1967 выплаўлена (тыс. *т*): чыгуну 3057, сталі 3696, алюмінію 38, выраблена цэменту 6405. Ёсць асобныя прадпр. фармацэўтычнай, радыё- і электратэхнічнай прамысл., каляровай металургіі у вялікіх гарадах Пд і ПдУ. Даўж. чыг. 38,3 тыс. *км*, аўтамаб. дарог 460 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 60 тыс. *км*. На большай частцы тэр. Б. дарог няма зусім. Унутраных водных шляхоў 35,3 тыс. *км*. Вял. значэнне мае марскі і авіятранспарт. Гал. аэрапорты: Рыо-дэ-Жанейра, Сан-Паўлу, Бразілія. Гал. порты: Рыо-дэ-Жанейра, Сантус, Віторыя, Рыу-Гранды, Порту-Алегры, Паранагуа, Салвадор, Рэсіфі, Белен. Танаж рачных і марскіх суднаў 1294 бр. рэг. *т* (1967). У 1967 экспарт склаў 1,6 млрд. дол., імпарт 1,7 млрд. дол. Б. вывозіць каву, бавоўну, жал. руду, цукар, каштоўную драўніну, какаву-боб, тытунь, рыс, мінер. сыравіну; увозіць машыны і абсталяванне, хім. і фармацэўтычныя тавары, харч. тавары, сыравіну. Асн. партнёры ў гандлі ЗША, ФРГ, Вялікабрытанія, Італія, Францыя. 10% экспарту і імпарту прыпадае на краіны Лац. Амерыкі, 6% — на сацыяліст. краіны (1966). Грашовая адзінка — крузейра.

Узброеныя сілы складаюцца з сухап. арміі, ВПС і ВМС. Узначальваюцца прэзідэнтам. Налічваюць да 195 тыс. чал. У сухап. войсках (калі 120 тыс. чал.) 7 пяхотных, 1 танкавая, 5 кавалерыйскіх (механізаваных) дывізій і да 15 асобных пяхотных батальёнаў. ВПС складаюцца з авіяц. груп, налічваюць да 30 тыс. чал., 300 баявых самалётаў, з іх каля 50 бамбардзіроўшчыкаў, 190 знішчальнікаў і 50 разведчыкаў. ВМС (калі 45 тыс. чал.) складаюцца з ВМФ (больш за 90 карабляў, у т. л. 1 авіяносец, 2 крэйсеры), марской авіяцыі (20 процілодачных самалётаў і верталётаў) і марской пяхоты (1 дывізія і падраздзяленні забеспячэння). Асн. ваен.-марскія базы: Рыо-дэ-Жанейра, Белен, Натал, Рэсіфі, Салвадор.

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя ў Б. дзяржаўная, страхавая і прыватная. Бальнічных ложкаў у 1964 — 3,4 на 1000 чал. насельніцтва. 40% бальнічных ложкаў належыць дзяржаве. Урачоў 30 000 (4 на 10 тыс. чал. насельніцтва), мед. сясцёр 6684. У 1964 нараджальнасць 43, смяротнасць 13 на 1000 чал. насельніцтва; дзіцячая смяротнасць — 170 на 1000 жыванароджаных. Сярэдняя працягласць жыцця 42,5 года. Найб. пашыраны тыф, малярыя, праказа, туберкулёз, трахома, лейшманіёз, дзіцячыя інфекцыі.


Асвета. Першыя школы ў Б. ўзніклі ў 1-й пал. 16 ст. У 1827 прынята закон пра арг-цыю дзярж. пач. школ, але ён не выконваўся. Канстытуцыя 1946 абвясціла абавязковае бясплатнае пач. навучанне. 46,4% нас., старэйшага за 15 гадоў, у 1960 было непісьменнае. Дашкольныя ўстановы для дзяцей ад 3 да 7 гадоў. Школы дзярж. і прыватныя (апошнія пераважна канфесійныя). Пач. школа (пераважна дзярж. школы) мае 2 цыклы: 4-гадовы і 1-гадовы (дадатковы курс). У 1966 у пач. школах вучылася 10 695 тыс. дзяцей. Сярэдняя школа 7-гадовая, мае 2 ступені: 4-гадовыя гімназіі і 3-гадовыя калегіі. У калегіях 2 аддзяленні — класічнае і рэальнае. У 1966 у сярэдніх школах займалася 1805 тыс. вучняў, у 6—7-гадовых камерцыйных, прамысл. і с.-г. школах — больш за 412 тыс. чал. Больш за палову ВНУ прыватныя. Ун-ты: Бразільскі ў Рыо-дэ-Жанейра (з 1920), у Сан-Паўлу (з 1934) і інш. У 1966 у ВНУ займалася больш за 180 тыс. студэнтаў. Найбольш вядомыя б-кі: Нацыянальная, Партугальская каралеўская чытальная зала, б-ка Мін-ва замежных спраў (усе ў Рыо-дэ-Жанейра), Муніцыпальная б-ка ў Сан-Паўлу; з музеяў самыя вядомыя — Нац. музей, Нац. гістар. музей, Нац. музей прыгожых мастацтваў (усе ў Рыо-дэ-Жанейра); этнаграфічны музей, музей сучаснага мастацтва (у Сан-Паўлу). Асн. навук. цэнтры краіны: Браз. АН (засн. ў 1916), Нац. тэхнал. ін-т (засн. ў 1935), Нац. мед. акадэмія, НДІ с. гасп. і біялогіі (усе асн. навук. ўстановы ў Рыо-дэ-Жанейра і Сан-Паўлу).

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1967 у Б. выходзілі 288 штодзённых газет, а таксама іншыя перыяд. выданні. Найбольш уплывовыя газеты: «O Globo» («Зямны шар»), «Ultima Hora» («Апошні час»), «Correio da Manhã» («Ранішняя пошта»), «Jornal do Brasil» («Бразільская газета»), «O Jornal» («Газета»). Урадавае інфарм. агенцтва — Нацыянальнае агенцтва (L' Agência Nacional). У 1966 было 944 радыёстанцыі, 118 тэлевізійных станцый і студый. Бурж. манапаліст. асацыяцыя «Дыярыус асасіядус» кантралюе 50 газет і часопісаў, 23 радыёстанцыі і 17 тэлевізійных кампаній.

Літаратура. Л-ра Б. на партуг. мове ўзнікла ў 16—17 ст. (трактаты і пісьмы місіянераў-езуітаў). Вытокі браз. фальклору ў партуг., негрыцянскай і індзейскай нар. творчасці. Паэт 17 ст. Г. ды Матус у сатырах адлюстраваў сац. супярэчнасці калан. грамадства. У 2-й пал. 18 ст. ўзніклі браз. асветніцтва (паэты Ж. Базіліу да Гама, Ж. ды Санта Рыта Дуран) і класіцызм (паэты Т. А. Гансага, К. М. да Коста). З 30-х г. 19 ст. пануе рамантызм, аначальны плынь якога — «індыянізм» — шырока выкарыстоўвала індзейскі фальклор (паэзія А. Гансалвіса Дыяса, раманы Ж. М. ды Аленкара). У 50—60-я г. ў творах паэтаў-рамантыкаў М. А. Алвариса ды Азеведу, Л. Н. Фагундыса Варэлы, К. Ж. ды Абрэу загучалі матывы разгубленасці, страху перад бурж. рэчаіснасцю. У той самы час А. Кастру Алвіс стварыў паэзію высокага грамадз. пафасу, прасякнутую рэвалюц. і абаліцыянісцкімі ідэямі, яго творчасць — найвышэйшы ўзлёт рэвалюц. рамантызму. Рамант. тэндэнцыі ўласцівыя раманам Ж. М. ды Маседу, камедыям К. Мартынса Пены і раману М. А. ды Алмейды «Успаміны сяржанта паліцыі». Пад уплывам творчасці Э. Заля ўзнік натуралізм (Э. Інглес ды Соза, Жуліу Рыбейру, А. Камінья). Лепшыя сац. раманы прадстаўніка

гэтай школы Алуізіу Азеведу спрыялі станаўленню рэаліст. метаду. Майстрам крытычнага рэалізму быў Ж. Машаду д'Асіс. У канцы 19 — пач. 20 ст. паявіліся апавяданні т. зв. рэгіяналістаў пра жыццё асобных раёнаў Б. (А. Арыпус ды Мелу Франку, Ж. Сімоінс Лоніс Нету). Новай ступеняю рэалізму стала творчасць А. ды Лімы Барэту, які спалучаў псіхалаг. майстэрства з гратэскавай сатырай. Паэзія канца 19 ст. развівалася пад уплывам франц. л-ры (А. Вілак, А. ды Алівейра; сімвалісты Ж. ды Крус-і-Соза, А. ды Гімараінс). У прозе сімвалізм выявіўся ў раманах Ж. да Грасы Араны. У 20-я г. вылучыўся мадэрнізм (М. ды Андрадзі, Ж. О. ды Андрадзі, М. Бандэйра, Р. Боп, Ж. ды Ліма). Большасць твораў пісьменнікаў-рэалістаў 30-х г. ставіць праблему ПпУ краіны, які быў спустошаны латыфундыстамі і дзе насельніцтва паміралa з голаду. «Раман Паўночнага Усходу» — вяршыня браз. рэалізму (Г. Рамус, Ж. Ліпса ду Рэгу, Ж. Амаду, Р. ды Кейрус). Пасля 2-й сусв. вайны з'яўляюцца новыя творы майстроў браз. прозы Ж. Ліпса ду Рэгу, Ж. Амаду, Э. Верысіму. Традыцыя рэгіяналістаў паглыблена ў прозе Ж. Гімараінса Розы. Значныя сац. раманы напісалі С. Мартынс, А. Каладу, М. Палмерыу, Ф. Жулійн. Сярод паэтаў вядомыя В. ды Мараіс, К. Д. ды Андрадзі, С. Мейрэліс, Ж. Кабрал ды Мелу Нету. Гал. тэма браз. навелістаў — быт і псіхалогія «маленькага чалавека» (Маркіс Рэбелу, М. ды Алкантара Машаду, А. Машаду). Асабліва багатая сучасная драматургія: калі старэйшае пакаленне драматургаў (Нелсан Радрыгіс, Г. Фігейраду, П. Блох, Ж. Камаргу) выкарыстоўвала ўмоўнасць, алегорыю, элементы фрэйдызму, то маладыя драматургі (Ж. Дыяс Гомес, А. Суасуна, А. Баал) звярнуліся да традыцый фальклорнага тэатра.

Архітэктура і выяўленчае мастацтва. Традыц. жыллё індзейцаў — хацiны, часта ўпрыгожаныя роспісам (індзейцы тукано), прамавугольныя і паўсферычныя дамы (індзейцы карыбы) і інш. З пач. 16 ст. ў Б. з'яўляецца мураванай архітэктура: партугальцы будуюць гарады і крэпасці (Алінда, Рэсіфі, Салвадор), цэрквы-базілікі і інш. У 18 ст. пануе барока, гал. прадстаўнік — арх. і скульптар Алейжадыньо (ц. Сан-Францісіку ў Ору-Прату, скульптура для ц. Бон-Жэзус-ды-Матазіньюс у Кангоньясе). З канца 18 ст. пашыраецца класіцызм (арх. А. Гранжан дэ Мантыньі), на змену якому ў канцы 19 ст. прыходзіць эклектыка, потым «мадэрн». Сучасная архітэктура Б. ствараецца з улікам прыродных і кліматычных умоў: ставяцца будынкі пластычнай, крывалінейнай формы са шкляным, смальтавым і кафляным пакрыццём, з своеасаблівымі прыстасаваннямі ад сонца (арх. ансамбль на ўзвышшы Педрэгулью, арх. А. Э. Рэйдзі; будынак Мін-ва асветы ў Рыо-дэ-Жанейра, арх. Л. Коста, О. *Німеер*, Рэйдзі і інш.). Вядуцца эксперыменты ў галіне горадабудаўніцтва (гл. г. *Бразілія*). Значных поспехаў дасягнула садова-паркавая архітэктура (Р. Бурле Маркс і інш.). Мастацтва Б. ўвабрала ў сябе творчасць этнічных груп, якія склалі нацыю, і асімілявала шматлікія знешнія ўплывы. Ад старажытнасці дайшлі кераміка, каменныя




Раён Маро да Віува
ў Рыо-дэ-Жанейра. Спрадзіна 20 ст.

вырабы. У 16—18 ст. мастацтва, звязанае з рэлігіяй, ствараецца ў формах барока. У 1820 створана Акадэмія мастацтваў. Жывапіс набывае парадны характар. Пашыраны гістарычны і пейзажны жанры. Абуджаецца цікавасць да жыцця простых людзей (Ж. Ф. ды Алмейда Жуніар, мастакі «Свабоднай майстэрні»). З 1922 у мастацтве Б. пачынаецца рух (т. зв. «Тыдзень сучаснага мастацтва»), якому характэрна спалучэнне мадэрнісцкіх пошукаў з імкненнем стварыць нац. па характары і сучасныя па духу творы. Найб. значны прадстаўнік маст. 30—50-х г. К. Партынары. У 50-я г. фарміруецца прагрэс. школа нац. графікі («Клуб сяброў гравюры»), адна з перадавых у сучасным замежным мастацтве. З спрадзіны 20 ст. значнае месца заняў фармалізм (С. Флесар і інш.).

Музыка. У браз. музыцы сінтэзаваны элементы індзейскай, афр. і еўрап. (пераважна партуг.) музыкі. З негрыцянскім уплывам звязана пашыранне спецыфічных песенна-танц. формаў (самба, луиду), ударных інструментаў (марымба і інш.). Адзін з першых браз. кампазітараў — Ж. Н. Гарсія, аўтар духоўных твораў. Сярод кампазітараў 2-й пал. 19 ст. вылучаюцца А. К. Гомес (стваральнік нац. оперы), А. Непамусену. У 20 ст. вялікі ўклад у развіццё браз. музыкі зрабіў Э. *Віла-Лобас*. З прыхільнікаў нац. кірунку ў музыцы: кампазітары А. Л. Фернандэс, Ф. Міньёне, Ж. Сікейра (таксама і дырыжор). У Рыо-дэ-Жанейра і Сан-Паўлу працуюць оперныя т-ры, сімф. аркестры. Навуч. і навук. ўстановы: Браз. кансерваторыя, Муз. акадэмія, Нац. кансерваторыя харавых спеваў (засн. Віла-Лобасам), кансерваторыі ў Сан-Паўлу, Белу-Арызонты, Порту-Алегры і інш.

Тэатр. Элементы т-ра ёсць у абрадавых гульнях афразбразільскага культу, т. зв. макумбах. Першыя спектаклі наладжвалі езуіты ў 16 ст.—

О. Німеер. Будынак Нацыянальнага кангрэсу ў г. Бразілія. 1960.
Алейжадыньо. Статуя прарока каля царквы Бон-Жэзус-ды-Матазіньюс у Кангоньясе. Закончана ў 1805.





ставілі інсцэніроўкі літ. твораў ці стваралі аўта (кароткія драм. паказы на рэліг. сюжэты). У спрадзіне 18 ст. ў Рыо-дэ-Жанейра адбыліся першыя аматарскія оперныя спектаклі. У 1813 адкрыты Каралеўскі тэатр св. Жуана, дзе выступалі пераважна партуг. і італьян. трупы. Абвяшчэнне незалежнасці Б. садзейнічала развіццю нац. т-ра і драматургіі. Пасля 1-й сусв. вайны колькасць замежных труп паменшала. У пач. 20-х г. створаны пастаянныя драм. трупы К. ды Соза, А. Азеведу, Л. Фроіса, Г. Кардзіна. У гады 2-й сусв. вайны ў Б. працавалі дзеячы замежнага т-ра. У пасляваенны час узнікла многа тэатр. груп у Рыо-дэ-Жанейра і Сан-Паўлу, тэатр. навучальных устаноў, развіваецца аматарскі т-р. Пашыраны муз.-драм. спектаклі.

Кіно. У 1903 пачалася нац. вытворчасць фільмаў. Пераважна ставіліся браз. варыянты замежных фільмаў, прымітыўныя экранізацыі твораў л-ры. З паяўленнем гукавых фільмаў у 30-я г. сталі здымацца вядомыя спевакі, шырока выкарыстоўваліся нац. мелодыі. У 50-я г. пад кіраўніцтвам рэж. А. Кавальканці выпушчана некалькі прагрэс. фільмаў. Прагрэсіўная і творчасць рэжысёраў т. зв. «новага кіно» (50-я — пач. 60-х г.), якая склалася пад уплывам італьян. неарэалізму. Вылучаюцца фільмы: «Кангасейра» (1953), «Песня мора» (1954), «Рыо, 40°» (1955), «Там, дзе канчаецца асфальт» (1956), «Абяцанне» (1962), «Высушаныя жыцці» (1964).

Літ.: Бразилия. Экономика. Политика. Культура, М., 1963; Глинкин А. Н. Новейшая история Бразилии (1939—1959 гг.), М., 1961; Очерки истории Бразилии, М., 1962; Гопионский С. А. Очерки новейшей истории стран Латинской Америки, М., 1964; Кобыш В. Бразилия без карнавала, М., 1968; Колесник С. В. По Бразилии, М., 1958; Экономика и внешняя торговля стран Латинской Америки, М., 1966; Помбу Роша. История Бразилии, пер. с португ., М., 1962; Руй Фако. Бразилия XX столетия, пер. с португ., М., 1962; Под небом Южного Креста. Бразильская новелла XIX—XX веков, пер. с португ., М., 1968; Тертерян И. А. Бразильский роман XX века, М., 1965 (бібліягр.); Шур Л. А. [скл.]. Художественная литература Латинской Америки в русской печати, [т. 1—2], М., 1960—66; Всеобщая история искусств, т. 6, кн. 1, М., 1965, с. 390—397.

І. Я. Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *А. І. Казлоў* (гістарычны нарыс). Мінск; *І. А. Гэртэран* (літаратура), *В. А. Віноградава* (музыка). Масква.

БРАЗІЛІЯ (Brasilia), новая сталіца (з 1960) Бразіліі. Буд-ва пачата ў 1956. Размешчана на плато, на выш. 1172 *м* над узр. м. на беразе штучнага вадасх. Чыг. ст. Аэрапорт. 390 тыс. ж. (1968). Ун-т. Спраектавана Б. як адм. цэнтр, прамысл. прадпрыемстваў няма. План горада (арх. Л. Коста) нагадвае самалёт або птушку ў палёце. «Крылы» складаюцца з жылых кварталаў. На падоўжнай восі — плошчы (спускаюцца да штучнага возера) з грамадскімі будынкамі арыгінальнай формы. Найб. цікавыя: палац Нац. кангрэсу, небаскроб сакратарыяту, рэзідэнцыя прэзідэнта, палацы Урада і Юстыцыі (1957—60, арх. О. Німеер).

Літ.: Столицы стран мира, М., 1965; Нимейер О. Мой опыт строительства Бразилиа, пер. с португ., М., 1963.

БРАЗІЛЬСКАЕ НАГОР'Е, Бразільскае пласкагор'е, на У Паўд. Амерыкі, паміж Амазонскай, Ла-Плацкай нізінамі і Атлантычным ак. Пл. каля 5 млн. *км*². Пераважаюць выш. 500—1000 *м* над узр. м. Найвыш. пункт — г. Бандэйра, 2890 *м*, на ПдУ.

Аснову В. н. складае дакембрыйскі крышталічны шчыт з гнейсаў, гранітаў і крышталічных сланцаў, якія на У месцамі выходзяць на паверхню, а на астатняй тэр. ўкрыты адкладамі палеазою і мезазою. На Пд вял. плошчу займаюць трапы — трыясавыя базальтавыя лавы. У спрадняй частцы — сталовыя горы і цясніны, плоскія ўзвышшы падняцці і катлавіны. В. н. багата на жал., марганцавыя і хромавыя руды, золата, баксіты, руды нікелю, уран, алмазы і інш. Клімат пераважна трапічны з вільготным (летам) і сухім (зімой) перыядамі. Найбольшыя рэкі: Парана, Сан-Францісіку, Такантынс з прытокам Арагуая. Большая частка нагор'я ўкрыта саванамі. На Пд ад 24° паўд. ш. на плато хвойныя араўкарыевыя лясы, на ўсх. схілах — горныя вільготнатрапічныя.


БРАЗІЛЬСКАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ (БКП; да ліпеня 1961 Камуністычная партыя Бразіліі), створана ў перыяд вострых класавых баёў браз. пралетарыяту і пад уплывам ідэй Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі 25—27.3.1922 на 1-м Нац. кангрэсе ў Рыо-дэ-Жанейра. Неўзабаве ўступіла ў Камуніст. Інтэрнацыянал. Праз некалькі месяцаў была забаронена. Вяла рэвалюц. дзейнасць у падполлі.

Па ініцыятыве БКП у 1929 створана Усеагульная канфедэрацыя працоўных Бразіліі, а вясной 1935 — Нац.-вызв. альянс, які з'яўляўся палiт. кааліцыяй шэрагу партый і грамадскіх арганізацый і меў антыімперыяліст., антыфеад. і антыфаш. характар. Альянс выпрацаваў рэвалюц. праграму. Яго дзейнасць перарасла ва ўзбр. паўстанне ў ліст. 1935. Па ініцыятыве БКП створана народна-рэвалюц. армія. Хоць узбр. барацьба браз. народа супраць фашызму і рэакцыі пацярпела паражэнне, але яна зрабіла ўплыў на пазіцыю Бразіліі ў 2-й сусв. вайне (Бразілія парвала дыпламат. адносіны з фаш. дзяржавамі і выступіла на баку антыгітлераўскай кааліцыі). Разгром паўстання, арышт і зняволенне старшыні альянсу Л. К. Прэстэса, а ў 1940 амаль усяго кіраўніцтва БКП паставілі партыю ў цяжкае становішча. Але ў час 2-й сусв. вайны партыя зноў узмацніла сваю дзейнасць, узнавіла (жн. 1943) цэнтр. кіраўніцтва і разгаміла ліквідатараў, якія патрабавалі самароспуску арганізацыі БКП у імя «нац. адзінства». Пад націскам дэмакр. сіл урад выдаў дэкрэт (18.4.1945) пра амністыю ўсіх паліт. зняволеных. Партыя выйшла з падполля. Яе мужная барацьба за дэмакр. свабоды, агр. рэформу і ліквідацыю перажыткаў феадалізму мела шырокі водгук сярод працоўных. За 2 гады легальнай дзейнасці БКП выраслa ў масавую партыю, дамаглася поспеху на парламенцкіх выбарах 1945 і асабліва на муніцыпальных выбарах 1947. Аднак браз. рэакцыя ў маі 1947 зноў дабілася забароны кампартыі.


У абставінах новага ўздыму рабочага і дэмакр. руху ў сярэдзіне 50-х г. адбыўся IV з'езд БКП (7—11.11.1954), які прыняў праграму партыі. Кіраўніцтва БКП крытычна прааналізавала дзейнасць партыі і асудзіла памылкі сектанцка-дагматычнага, рэвізіяніскцка-лявацкага характару, актывізавала работу ў масах. V з'езд БКП (вер. 1960) арыентаваў камуністаў на барацьбу супраць імперыялізму ЗША і рэакцыі ў краіне, на ўмацаванне адзінага фронту прагрэс. сіл. Гэта дазволіла партыі адыграць важную ролю ў арганізацыі нар. мас на барацьбу супраць спробы рэакц. перавароту ў жн. 1961. Пасля рэакц. ваен. перавароту 1.4.1964 на БКП абрушыліся рэпрэсіі. Партыя працуе ў глыбокім падполлі. У снеж. 1967 адбыўся VI з'езд, які абмеркаваў сучаснае становішча ў Бразіліі, прааналізаваў прычыны, што абумовілі перамогу рэакцыі ў 1964. З'езд разгаміў унутрыпартыйную «левую» апазіцыю, адхіліў немарксісцкія канцэпцыі браз. рэвалюцыі, абараніў ленінскія арганіз. прынцыпы. Партыя выступае за аб'яднанне ў антыдыктатарскім фрон-

це розных паліт. плыняў, каб панесці паражэнне рэакцыі і адкрыць шлях да дэмакр. сац. пераўтварэнняў у краіне. БКП паслядоўна адстойвае прынцыпы інтэрнацыяналізму ў міжнар. камуніст. руху, яе дэлегацыі ўдзельнічалі ў рабоце Маскоўскіх нарад прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый у 1957, 1960 і 1969. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. Ген. сакратар ЦК Луіс Карлас *Прэстэс*. Друкаваны орган — штотыднёвая газета «Voz Operaria» («Голас рабочых»). *Л. Я. Машазерская*. Масква.


БРАЙЛЕЎСКАЕ ПІСЬМО, сістэма выпуклага пісьма для сляпых, якую стварыў Л. *Брайль*. Грунтуецца на пэўнай камбінацыі выпуклых кропак (для літар да 6, для лічбаў да 8). Прыстасавана таксама для нотапісу, матэматыкі і інш. навук. Першай кнігай, надрукаванай такім шрыфтам, была «Гісторыя Францыі» (1837). У Расіі Б. п. пачалі карыстацца з 1885. Прынята ва ўсіх краінах свету.



Рускі алфавіт рэльефнага шрыфту Брайля.



Лічбы па Брайлю.



Знакі прыпынку па Брайлю.

БРАЙЛЬ, Б р а й (Braille) Луі (4.1.1809—6.1.1852), французскі тыфлапедагог. Сын рамесніка, сляпы з 3 гадоў. Вучыўся у Парыжскім ін-це сляпых дзяцей, дзе потым і настаўнічаў. У 1829 распрацаваў кропкавы выпуклы шрыфт для сляпых, які атрымаў назву *Брайлеўскае пісьмо*.

Літ.: Красноусов П. Д. и Шоев Ф. П. Луи Брайль, М., 1959.

БРАЙЦАЎ Васіль Раманавіч [26.2(10.3). 1878, в. Забялышын Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.— 6.7.1964], савецкі вучоны ў галіне хірургіі. Правадз. чл. АМН СССР (1945). Чл. КПСС з 1943. У 1906 скончыў мед. ф-т Маскоўскага ун-та. У 1911—13 земскі ўрач у Пінску. Займаўся навук.-практычнай, пед. дзейнасцю (1914—36), заг. кафедры клінічнай хірургіі ін-та ўдасканалення ўрачоў (1937—64) у Маскве. Асн. працы па пластыцы стрававода, хірург. лячэнні хвароб прамой кішкі, лёгкіх, плеўры, жоўцевага пузыра. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Заболевания прямой кишки, М., 1952; Врожденные (дизонтогенетические) образования средостения и легких, М., 1960.

БРАЙЦАЎ Якуб (Якаў Раманавіч; 19.2.1861, в. Забялышын Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.— 2.3.1931), рускі празаік, драматург, паэт. З сялян. Скончыў Клімавіцкае павятовае вуч. У 1905 за рэвалюц. дзейнасць быў пад наглядам паліцыі. З 1917 сакратар Забялышынскага валвыканкома, павятовы пракурор, настаўнік. У 20-я г. супрацоўнік «Крестьянской газеты» (Масква), у якой друкаваў вершы і нарысы. Чл. Усерас. саюза сялянскіх пісьменнікаў. У Маскве выдаў кн. «Багацеі. Аповесць з беларускага простанароднага жыцця» (1889). Рукапісы аповесцей «Няўдалічка Анюта» (1887), «Старая вёска», «Юда» (1899), камедыі «Цыганова бяда» (1905), рамана «Сяродбалотаў і лясоў» (1913—16) і інш. у Цэнтр. дзярж. архіве л-ры і маст. БССР. У творах Б. паказана сац. несправядлівасць, гаротнае жыццё пры паншчыне, барацьба з прыгнятальнікамі.

Тв.: Дудалёва лава, «Беларусь», 1966, № 9 (з біягр. даведкай). *С. П. Шушкевіч*. Мінск.

БРАК ВЫТВОРЧЫ, прадукцыя (вырабы, паўфабрыкаты, дэталі, вузлы і інш.), якая цалкам або часткова не адпавядае вызначаным патрабаванням. Бывае поўны (канчатковы) брак, калі прадукцыя не можа быць выкарыстана па сваім непасрэдным прызначэнні, і частковы, калі (пры эканамічнай мэтазгоднасці) прадукцыю можна выкарыстаць.

Пры дапушчэнні частковага браку па віне работніка выкананая работа аплачваецца ў паніжаным памеры, але не вышэй за палову вдзельнай тарыфнай стаўкі. Калі поўны брак вроблены не па віне работніка, за выкананую работу выплачваецца $^2/_3$ тарыфнай стаўкі пачасовай аплаты работніка адпаведнага разраду. Работа з вытворчым бракам, дапушчаным пры асваенні новай вытворчасці, аплачваецца з разліку тарыфнай стаўкі пачасовай аплаты работніка.


БРАКА (Broca) Поль (28.6.1824, дэпартамент Жыронда — 9.7.1880), французскі антраполаг і анатам. Вывучаў марфалогію мозгу, яго функцыі і параўнальную анатомію прыматаў. Адкрыў мазгавы цэнтр мовы, т. зв. поле Брака. Распрацаваў праграмы антрапалаг. даследаванняў, сабраў багатыя антрапалаг. калекцыі.

БРАКАВА, вёска ў Княжыцкім с/с Магілёўскага р-на. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 21 *км* на ПнЗ ад Магілёва, 25 *км* ад чыг. ст. Магілёў. 576 ж., двароў 194 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БРАКАНЬЕРСТВА (франц. braconnage), парушэнне правілаў паляванння, рыбнай лоўлі і выкарыстання прыродных багацця ў. Прычыняе шкоду нар. гасп. краіны. У сувязі з нацыяналізацыяй зямлі, лясоў і водаёмаў у Сав. Саюзе прыродныя багацці з'яўляюцца ўсенародным здабыткам, і таму грамадзяне СССР маюць права карыстацца імі адпаведна з інтарэсамі грамадства і дзяржавы. Для аховы прыродных багацця ў вызначаны пэўны парадак паляванння, рыбнай лоўлі і інш. На тэр. БССР ён рэгламентуецца «Палажэннем пра паляўнічую гаспадарку Беларускай ССР» ад 9.11.1962, «Палажэннем пра дзяржаўны запаведнікі Беларускай ССР» ад 23.8. 1962, «Правіламі рыбалоўства ў водаёмах Беларускай ССР» ад 18.10.1968. Вінаватыя ў парушэнні правілаў і палажэнняў па ахове прыроды прыцягваюцца да адм., а ў пэўных выпадках і крымін. адказнасці. Гл. таксама *Ахова прыроды*. *Д. А. Саркісава*. Мінск.

БРАКГАЎЗА ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ, энцыклапедыя нямецкай выдавецкай фірмы, засн. у 1805 у Амстэрдаме і купленай у 1808 кнігагандляром Ф. А. Бракгаўзам.

1-е выданне энцыклапедыі [выходзіла з 1796 пад назвай «Conversations Lexikon» («Гутарковы слоўнік»)] закончана у 1811. 15-е — у 1929—35 у 20 т. (у 1937 выйшаў дадатковы 21 том) пад назвай «Вялікі Бракгаўз» (у апошніх яго тамах змешчаны артыкулы фашысцкага характару). У 1936—38, 1941—42 двойчы выдаваўся 4-томны «Новы Бракгаўз», які адкрыта прапагандаваў ідэалогію фашызму. 16-е выданне (12 асн. і 2 дадатковыя тамы) выйшла ў Вісбадэне (ФРГ) у 1953—63 пад назвай «Вялікі Бракгаўз». У 1958—64 у ФРГ выйшлі 6 т. «Новага Бракгаўза». У выданні Бракгаўза і І. А. Эфрона (рус. друкар-прадпрыемец) выйшла рус. дарэвалюцыйная энцыклапедыя «Энцыклапедычны слоўнік». 1-е выд. (82 асн. тамы і 4 дадатковыя паўтамы) выпушчана ў Пецярбургу ў 1890—1907. У першых тамах (да літары «В» пад рэд. І. Я. Андраеўскага) змяшчалася многа перакладных артыкулаў (з ням. энцыклапедыі Бракгаўза). Пасля смерці Андраеўскага новая рэдакцыя на чале з К. К. Арсеньевым і праф. Ф. Ф. Петрушэўскім павялічыла колькасць самастойных артыкулаў. Пісаць артыкулы былі запрошаны вядомыя рус. вучоныя: Дз. І. Мендзялееў вёў хіміка-тэхн. і фабрычна-заводскі аддзел, А. І. Ваейкаў — аддзел геаграфіі, А. М. Бекетаў, У. Ц. Шавякоў і акад. А. А. Кавалеўскі — аддзел біял. навук. Слоўнік насычаны фактычным, лічбавым і біягр. матэрыламі, мае высокі навук. ўзровень артыкулаў па прыродазнаўчых навуках і тэхніцы. Праблемы грамадскага, філасофскага характару трактуюцца з ідэалістычных пазіцый, пытанні класавай і рэвалюцыйнай барацьбы ігнаруюцца. У 1911—16 выйшла 2-е выданне — «Новы энцыклапедычны слоўнік» (выдадзена 29 тамоў з 48).



Брама брыгіцкага манастыра ў Гродне. 1642 — 51.

БРАМА, частка арх. збудавання ці самастойная манументальная арка. У Расіі і на Беларусі Б. будаваліся з даўніх часоў, асабліва былі пашыраны ў 17—18 ст. Ставіліся пры ўездзе у гарады (Магілёў, *Слуцкая брама* ў Нясвіжы), каля манастыроў (Гродна, Слонім), каля магнацкіх палацаў (Ружаны), уваходзілі ў арх. комплексы манастыроў. Разнастайныя паводле тыпаў, Б. мелі плоскасную ці аб'ёмную будову, вызначаліся закончанасцю і прыгажосцю формаў. Асобныя Б. былі дэкаратыўныя. *У. А. Чантурыя*. Мінск.

БРАМАНТЭ (Bramante; сапр. П а с к у ч ы о д'А н т о н і о) Даната (1444, Монтэ-Асдруальда каля Урбіна — 11.3.1514), італьянскі архітэктар Высокага Адраджэння. Пабудаваў у Мілане цэрквы Санта-Марыя прэса Сан-Сатыра (1482—86, з васьмігранным сакрыстыяй), Санта-Марыя дэле Грацые (з 1492) і інш.; у Павіі — ніжнія часткі сабора (з 1488 да 1492); у Віджэвана — гал. плошчу (з 1493). У 1499 пераехаў у Рым, дзе дабудаваў палац Канчэлерыя з вял. дваром, абкружаным аркадамі. Круглы храм Сан П'етра ін Манторыя (Тэмп'ета, 1502) — першае ўвасабленне ў натуры мараў Б.-гуманіста пра гарманічна ўраўнаважанае цэнтрычнае збудаванне. Двор Бельведэра ў Ватыкане, размешчаны на трох узлучаных лесвіцамі тэрасах (пачаты ў 1503; вельмі зменены пазнейшымі дабудоўкамі), даў пачатак далейшаму актыўнаму асэнсаванню архітэктарамі адкрытай садовай і гарадской прасторы. Сабор св. Пятра — гал. храм каталіцкай царквы, які будаваўся больш за 100 гадоў,— быў задуманы Б. (пачаты ў 1505) як цэнтрычнае збудаванне; план яго асноўваўся на спалучэнні грэч. крыжа і квадрата, а аб'ёмная кампазіцыя (потым зменена) — на падпарадкаванні складана-расчлянёных вуглавых купальных ячэек вялікаму цэнтр. купалу. Творчасць Б. зрабіла вял. ўплыў на развіццё архітэктуры ў еўрап. краінах.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 5, М., 1967; F ö r s t e r O. H. Bramante, Wien — München, 1956. *Г. І. Апачынская*. Масква.

БРАМІДЫ п р ы р о д н ы я, група мінералаў, солей броміставодародзнай кіслаты HBr. Не растваруюцца і захоўваюцца ў прыродзе толькі солі серабра: бромаргірыт (брамірыт) AgBr, ёдабраміт Ag(Br, Cl, I) і эмбаліт Ag(Br, Cl). Крышталі кубічнай сістэмы, найчасцей дробныя зерні. Колер жоўты, зеленавата-жоўты і жоўта-зялёны. Цв. 1—1,5; шчыльн. 5710—5900 *кг/м*^{3}. Утвараюцца як другасныя мінералы ў зоне выветрывання сярэбраных сульфідных радовішчаў, а таксама ў асадкавых радовішчах, якія залягаюць у саляносных адкладах. Радовішчы ў Чылі, ЗША і інш.

БРАМС (Brahms) Іаганес (7.5.1833, Гамбург — 3.4.1897), нямецкі кампазітар, піяніст, дырыжор. З сям'і музыканта. З 1862 жыў у Вене. Кіраўнік Поўчай акадэміі (1863—64), Таварыства аматараў музыкі (1872—75). Развіваў высокія этычныя ідэалы ням. класіч. мастацтва, даказаў жыццёвасць кампазіцыйных сродкаў мінулага. У лепшых інстр. творах рамантычная ўсхваляванасць пачуццяў спалучаецца са строгай засяроджанасцю



думкі. Самабытны стыль Б. вырас на ням. і аўстр. нар. аснове. Б. шырока выкарыстоўваў венг. (папулярныя «Венгерскія танцы») і славянскі фальклор. Яго музыку характарызуе своеасаблівасць ладагарманічных і рытмічных сродкаў, майстэрства тэматычнага развіцця. 4-я сімфонія і Канцэрт для скрыпкі з аркестрам належаць да вяршынь еўрап. сімф. музыкі. Сярод вак.-сімф. твораў найб. значны «Нямецкі рэквіем». Узвышаным харастом вызначаецца вак. лірыка Б.

Тв.: вак.-сімф.— Нямецкі рэквіем (1868), Рапсодыя (1869), Трыумфальная песня (1871) і інш.; для аркестра — 4 сімфоніі (1876, 1877, 1883, 1885), канцэрты — 2 фп. (1858, 1881), скрыпічны (1878) і інш.; 24 інстр. анс. (у т. л. 3 санаты для скрыпкі і фп., 6 квартэтаў, 4 квінтэты); для фп.— 3 санаты, варыяцыі (у т. л. на тэму Гендэля, на тэму Паганіні) і інш.; зв. 70 хораў, 80 вак. анс., каля 200 песень для голасу з фп., апр. нямецкіх нар. песень.

Літ.: Друскин М. Иоганнес Брамс, М., 1950; Гейрингер К. Иоганнес Брамс, [пер. з нем.], М., 1965.

БРАНАВІЦКІ Аляксандр Юльянавіч [н. 16(29).3.1914, в. Танежычы Слуцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне патафізіялогіі і тэарэтычнай медыцыны.



Чл.-кар. АН БССР (1950), д-р мед. навук (1940), праф. (1948). Чл. КПСС з 1944. Скончыў 2-і Ленінградскі мед. ін-т (1936). У 1950—53 дырэктар Ін-та тэарэт. медыцыны АН БССР, у 1953—59 заг. аддз. ўзроставай фізіялогіі Ін-та аховы мацярынства і дзяцінства Міністэрства аховы здароўя БССР, з 1958 заг. кафедры патафізіялогіі Мінскага мед. ін-та. Асн. працы па праблемах рэактыўнасці арганізма, шоку, следавых рэакцый, ролі нервовай рэцэпцыі і краніякаўдальнага градыента ў паталогіі кампенсатарных прыстасаванняў арганізма і канцэрагенезу. Старшыня навук. т-ва патафізіёлагаў БССР.

Тв.: Влияние выключения дистантных анализаторов на течение патологических процессов, у зб.: Современные вопросы нервизма в физиологии и патологии, М., 1958; Экспериментальная терапия некоторых форм гипоксии головного мозга, у зб.: Компенсаторные приспособления при патологии сердечно-сосудистой системы, Мн., 1966.

БРАНДЫС Анатоль Якаўлевіч (н. 12.8.1923, Екацярынаслаў), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (люты, чэрв. 1945). Канд. ваен. н. З рабочых. Чл. КПСС з 1944. З 1940 вучыўся ў Дняпрапятроўскай школе ВПС. У пач. Айч. вайны пераведзены ў Пермскае авіяц. вуч. штурмавікоў. Са жн. 1943 на Паўд. фронце. Удзельнік баёў на Украіне, у Крыме. Вызначыўся ў час прарыву варожай абароны каля Оршы і разгрому гітлераўскіх войск ва Усх. Прусіі. Зрабіў 228 баявых вылетаў. Пасля вайны скончыў Ваен.-паветр. акадэмію. Служыць у Сав. Арміі. У Дняпрапятроўску ўстаноўлены яго бюст.

БРАНДЫС (Brandys) Казімеж (н. 27.10.1916, Лодзь), польскі пісьменнік. Чл. ПАРП з 1946. Па адукацыі юрыст. Першы раман — «Драўляны конь» (1946). Асн. твор — тэтралогія «Паміж войнамі» (1948—51; Дзярж. прэмія 1950). Вострыя маральна-філас. праблемы сучаснасці распрацаваны ў аповесці «Маці Круляў» (1957), зб. апавяд. «Рамантычнасць» (1960).

Тв.: Бел. пер.— Грамадзяне, Мн., 1958; рус. пер.— Между войнами, т. 1—2, М., 1957—58.

БРАНДЭС (Brandes) Георг (4.2.1842, Капенгаген — 19.2.1927), дацкі літаратуразнавец. З бурж. сям'і. Літ. дзейнасць пачаў у сярэдзіне 60-х г. У курсе лекцый, якія чытаў у Капенгагенскім ун-це («Галоўныя плыні ў еўрапейскай літаратуры 19 ст.», т. 1—6, 1872—90), упершыню сістэматычна выклаў узаемаадносіны найбольш значных кірункаў і асобных нац. л-р у еўрап. літ. працэсе. Аўтар «манаграфій пра герояў» («Уільям Шэкспір», т. 1—3, 1895—96; «Вольфганг Гётэ», т. 1—2, 1914—15, і інш.), артыкулаў пра І. Тургенева, Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага. Адзін з першых адзначыў паэтычнае пралет. л-ры (артыкулы пра М. Горкага, М. Андэрсена-Нексё). Кн. «Польскія ўражанні» (1888) і «Рускія ўражанні» (1888), напісаныя пасля паездак у Польшчу (1886) і Расію (1887), спрыялі папулярызацыі слав. л-р, асабліва рус., у скандынаўскіх краінах. У публіцыст. зб. «Сусветная вайна» (1916—17) і «Другая частка трагедыі» (1919) ганьбіць мілітарызм і імперыялізм. Б.— перакананы абаронца рэалізму, праціўнік дэкадансу, містыцызму і рэліг. цемрашальства. У 1920 выступіў у абарону Сав. Расіі.

Тв.: Рус. пер.— Собр. соч., т. 1—20, 2 изд., СПб., [1906—14].

БРАНЕЎСКІ (Broniewski) Уладзіслаў (17.12.1897, Плоцк — 10.2.1962), польскі паэт. З сям'і службоўца. Удзельнік 1-й сусв. вайны. Вучыўся на філас. ф-це Варшаўскага ун-та. З пач. 20-х г. супрацоўнічаў у пралет. і дэмакр. друку, зблізіўся з КПП. У 1925 выйшаў першы зб. «Ветракі», у 1927 — «Дымы над горадам», у якіх Б. прадаўжаў рэвалюц. традыцыі польскага рамантызму. У 1925 з В. Вандурскім і С. Р. Стандэ выдаў т. зв. паэтычны бюлетэнь «Тры залпы» — першы ідэйна-маст. маніфест пралет. літ. групы. Зб. «Турбота і песня» (1932) спрыяў росту рэвалюц. свядомасці польскага пралетарыя-




ту. Героіка-рамант. паэма «Парыжская камуна» (поўнае выд. 1947) канфіскавана польскімі ўладамі ў 1929. У 30-я г. ў творчасці Б. ўмацоўваецца метад сацыялісц. рэалізму. Зб. «Апошні крык» (1939) уздымае тэму антыфаш. барацьбы. У 1939 эмігрыраваў у СССР, у 1942—45 жыў у краінах Б. і Сярэд. Усходу. Зб. «Зброю да бою» (1943) і «Дрэва ў роспачы» (1945) прасякнуты гуманіст. пафасам і глыбокім патрыятызмам. Герояў-антыфашыстаў і дружбу з сав. народам услаўляў зб. «Надзея» (1951). Філас., элегічныя, трагічныя матывы і сцвярджэнне жыцця ўласцівыя цыклам «Анка» (1956) і «Новыя вершы» (1962). Перакладаў рус. і сав. пісьменнікаў. Паэт. пераклады Б. ў кн. «Мае паэтычныя прыхільнасці» (1960). Дзярж. прэміі ПНР 1950 і 1955. На бел. мову Б. перакладалі Я. Купала, М. Танк, П. Броўка, М. Лужанін, М. Машара, П. Пестрак, М. Аўрамчык, М. Арочка, Р. Барадулін, Н. Гілевіч, С. Дзяргай, У. Дубоўка, А. Вялюгін і інш.

Тв.: Wiersze i poematy, Warszawa, 1966; бел. пер.— Дарогай дзён. Вершы і паэмы, Мн., 1961; рус. пер.— Избранное, М., 1961; Стихи, М., 1963.

Літ.: Хорев В. А. Владислав Броневский, М., 1965.

БРАНЗАВАННЕ, пакрыццё паверхні вырабаў слоем парашковай *бронзы*. Робіцца металізацыяй ці фарбаваннем бронзавымі лакамі, фарбамі. Надае вырабам дэкар. выгляд або стварае ахоўнае пакрыццё на паверхні металу, дрэва, паперы. У паліграфіі Б. практыкуецца для таго, каб атрымаць «залатыя» ці «сярэбраныя» адбіткі.

БРАНЗАЛЕТЫ, кольцападобныя ўпрыгожанні, якія надзяюць на рукі, у некаторых народаў і на ногі. Вядомы з глыбокай старажытнасці. У эпоху палеаліту выраблялiся з бівуняў маманта, у часы неаліту — з свідра-



Залаты бранзалет. Мінск. 12 ст. (злева). Шкляны бранзалет. Лукомль. 12—13 ст.

ванага каменю. На тэр. Беларусі вядомы найбольш стараж. медныя Б. бронзавага веку. У эпоху ранняга жалезнага веку былі пашыраны Б. з бронзы, жалеза і серабра, многія багата арнаментаваныя. Знаходкі ліцейных формаў сведчаць, што большасць Б. мясцовай вытворчасці. З развіццём гарадоў побач з металічнымі на Беларусі з'яўляюцца рознакаляровыя шкляныя Б. Прадстаўніцы знаці насілі сярэбраныя і залатыя Б.

БРАНІСЛАЎ, вёска ў Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл., каля р. Случ (3 *км*). Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на З ад Жыткавіч, 260 *км* ад Гомеля, 6 *км* ад чыг. раз'езда Дзедаўка. 559 ж., дварoў 197 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін, швейная майстэрня. Першае дакументальнае ўпамінанне пра Б. адносіцца да 18 ст. У барацьбе з нямецка-фаш. захопнікамі загінула 48 жыхароў вёскі.

БРАНІЦКІ Ян Клеменс (21.9.1689—9.10.1771), ваенны і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, сын падляскага ваяводы Стэфана Мікалая і Кацярыны Сапегі. Падчашы літоўскі з 1723, вялікі харужы войск польскай кароны з 1724, генерал артылерыі з 1728, гетман польны з 1735, вялікі гетман кароны польскай з 1752, кашталян кракаўскі з 1762. Б. належалі велізарныя спадчынныя латыфундыі на Украіне, Падляссі, Беларусі, у Польшчы, а таксама многія дзярж. староствы. Адзін з найбольш уплывовых людзей у Рэчы Паспалітай. Узначальваў кансерватыўную, т. зв. гетманскую, ці рэспубліканскую, магнацкую партыю, выступаў супраць прэтэндэнта на каралеўскі трон С. Ляшчынскага, у 1763—64 выстаўляў сваю кандыдатуру на каралеўскі трон, падтрымліваў Барскую і Радамскую канфедэрацыі. *П. Р. Казлоўскі.* Мінск.


БРАНСК, горад, цэнтр Бранскай вобл. РСФСР, на р. Дзясна. Транспартны вузел. 318 тыс. ж. (1970). У 1956 у склад Б. ўвайшоў г. Бежыца. Машынабудаванне (цеплаводы, суднавыя дызелі і інш.). З-ды: сталеліцейны, дарожных машын, ірыгацыйных машын «Ірмаш», с.-г. машын, фасфарытны, аўтамабільны, зборнага жалезабетону, шлакаблокаў; цагельня. Швейная і абутковая ф-кі, кансервавы і мясны камбінаты. Эл. станцыя.

Б. ўзнік як умацаваны славянскі пункт. Першапачатковая назва, паводле В. М. Таціщава, Брынь; потым Дзебранск. Упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1146. У 12 ст. належаў чарнігаўскім князям, з 1252 цэнтр Бранскага ўдзельнага княства. Каля 1356 захоплены Альгердам і ўключаны ў склад Вял. кн. Літоўскага. У 1500 Б. заняві войскі Івана III і горад увайшоў у Маск. дзяржаву. З 1709 у складзе Кіеўскай губ., з 1778 павятовы горад Арлоўскай губ. У 19 ст. цэнтр Бранскага прамысл. раёна. Сав. ўлада ўстаноўлена 25.10(7.11).1917. З 6.10.1941 да 17.9.1943 акупаваны нямецка-фаш. захопнікамі і разбураны; пад Б., у бранскіх лясах, дзейнічала каля 60 тыс. партызанаў.

Ін-ты транспартнага машынабудавання і тэхналагічны, 11 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

БРАНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 5.7.1944. Пл. 34,9 тыс. *км*². Нас. 1582 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 22 раёны; 15 гарадоў, 27 гар. нас. Цэнтр г. Бранск.

Рэльеф слабахвалісты. Усх. частка Б. в. ляжыць на вах. ускраіне Сярэднерускага і Смаленскага ўзвышшаў (выш. да 288 *м*), расчлянёных ярамі. Зах. частка больш плоская. Карысныя выкапні: фасфарыты, буд. м., торф, жал. руда (адгалінаванне Курскай магн. анамаліі). Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —8,8, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 550—600 *мм* за год. Большасць рэк належыць да бас. Дняпра; галоўныя — Дзясна з прытокамі і Іпуць. Глебы падзолістыя, на Пд і ПдЗ ападзоленыя чарназёмы, на ПнУ шэрыя і цёмна-шэрыя. Большая частка Б. в. знаходзіцца ў лясной зоне. Пад лесам каля 34% тэр., пераважае хвоя. Найбольшыя лясныя масівы на левабярэжжы Дзясны. Гасп. значэнне маюць лугі.



Асн. насельніцтва рускія. Жывуць украінцы, беларусы і інш. Сярэднярычны шчыльн. 45,3 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 47% (1970). Найбольшыя гарады: Бранск, Клінцы, Навазыбкаў, Дзяцькава, Унеча, Карачаў.

Валавая прадукцыя буйной прамысловасці за 1913—40 павялічылася ў 8,5 раза. Галоўныя галіны — машынабудаванне і металаапрацоўка. Найважнейшыя з-ды (пераважна ў ваколіцах Бранска): машынабудаўнічы, дарожных машын, ірыгацыйных машын, с.-г. машынабудавання, аўтамабільны, веласіпедны, станкабудаўнічы. Чыгуналіцейныя з-ды (Любахна, Бытош), сталеліцейны (Бранск), з-д зборнага жалезабетону (Бранск), абсталявання для тэкст. прамысл. (Клінцы), цэментная прамысл. (Фокіна), шклозаводы (Бытош, Іват, Стар). Усесаюзнае значэнне мае з-д крышталёвых вырабаў у Дзяцькаве. На мясц. сыравіне працуе вялікі з-д фасфатнай мукі. Энергетыка Б. в. базіруецца на торфе. У 1968 выпрацавана эл. энергіі 925 млн. *квт·гадз.* Газаправоды Дашава — Кіеў — Бранск — Масква і Шабялінка — Харкаў — Бранск, нафтаправод Куйбышаў — Бранск. З прадпрыемстваў лёгкай і харч. прамысл.— з-ды па першаснай апрацоўцы пянькі, вялікія шпагатныя ф-кі (Дуброўка, Клінцы), з-д каляровых скур, абутковыя і суконныя ф-кі (Бранск, Клінцы), камвольны камбінат (Бранск), тонкасуконныя ф-кі (Клінцы). Цукровы з-д (Лапандзіна), крухмальныя, кансервавыя і спіртавыя з-ды. Развіта лясная і дрэваапр. прамысловасць. Прадпрыемствы дрэваапрацоўкі (Белая Бярозка, Навазыбкаў), кардонная, мэблевая ф-кі (Сураж), запалкавая ф-ка (Злынка) і інш. Адзіны ў СССР цыгарны камбінат (Пагар). У вобласці 306 калгасаў і 125 саўгасаў (1970). Паслўная пл. ўсіх с.-г. культур у 1969 (тыс. *га*) 1326,1, пад збожжавымі і зернебабовымі 689,6, тэхн. 29,5, кармавымі 400,7, бульбай і агародніна 205,3. Асн. збожжавыя культуры (тыс. *га*): жыта (225,8), пшаніца (137,9). Сеюць авёс, проса, ячмень, грэчку, кармавы лубін. З тэхнічных — каноплі, буракі, лёндаўгунец, цыгарны тытунь. Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. На пач. 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 727,5 (у т. л. кароў 369,2), свіней 648,6, авечак і коз 299,1. У Б. в. густая сетка чыгунак (1060 *км*). Вялікія чыг. вузлы Бранск і Унеча. Шаша Арол — Бранск — Смаленск. Ін-ты: транспартнага машынабудавання, тэхналагічны, педагагічны; 25 сярэдніх спец. навучальных устаноў, 5 музеяў. Драм. тэатр. Абласная газета «Брянский рабочий».

В. Я. Крышчановіч. Мінск.

БРАНТ (Brandt) Вілі (сапр. Фрам Карл Герберт; н. 18.12.1913, г. Любек), паліт. і дзярж. дзеяч ФРГ. З 17 гадоў удзельнічае ў с.-д. руху. У 1933, пасля прыходу да ўлады фашыстаў, эмігрыраваў у Нарвегію, у 1940 выехаў у Швецыю. Пасля 2-й сусв. вайны вярнуўся ў Германію і ўключыўся ў паліт. жыццё. У 1957—66 правячы бургамістр Зах. Берліна. З 1958 чл. праўлення Сацыял-дэмакр. партыі Германіі, з 1964 яе старшыня. У 1966—69 віцэ-канцлер і міністр замежных спраў. З кастр. 1969 канцлер ФРГ.

БРАНТ Пётр-Уладзіслаў Казіміравіч (1836 ці 1837, в. Рудакі Свянцянскага пав. Віленскай губ.— 1912), удзельнік паўстання 1863 на Беларусі, у Літве і ў Польшчы. Адукацыю атрымаў у Маладзечне. У крас. 1863 паручнік Б. з групай рэвалюцыйна настроеных афіцэраў Лібаўскага пях. палка ўдзельнічаў у фарміраванні гал. паўстанкага атрада Гродзенскага ваяводства. 17.4.1863 змагаўся з царскім войскам пад Саколдай (Валіламі) Беластоцкага пав., потым на чале асобнага атрада ў Аўгустоўскім ваяводстве. У 2-й пал. 1863 кіраваў невялікімі атрадамі паўстанцаў з сялян. З канца 1863 у эмігрантцы (Парыж, Галіцыя). Напісаў успаміны пра паўстанне.

Тв.: Mój udział w powstaniu, у кн.: W czterdziesta rocznice powstania Styczniowego. 1863—1903, Lwów, 1903.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

БРАНТАЗАЎР (Brontosaurus), род вымерлых паўзуноў з групы яшчаратазавых дыназаўраў. Адна з найбольшых чатырохногіх наземных жывёл. Даўж. каля 25 *м*, маса больш за 35 *т*. Жыў у юрскім і мелавым перыядах. Спосаб жыцця наземнаводны. Карміўся раслінамі. Рэшткі Б. знойдзены ў Паўночнай Амерыцы.

Літ.: Ромер А. Ш. Палеонтология позвоночных, пер. с англ., М.—Л., 1939.

БРАНХІТ, запаленне бронхаў з паражэннем іх слізістай абалонкі, якое выклікаюць узбуджальнікі грыпу, катару верхніх дыхальных шляхоў, пнеўманіі, коклюшу, адру. Узнікненню Б. садзейнічаюць аслабленне арганізма, цяжкія ўмовы працы і быту, алкагалізм, курэнне, ахаладжэнне цела. Адрозніваюць востры і хранічны Б. Прыкметы вострага: пячэ за грудзінай, пасмарк, ахрыпласць, спачатку сухі кашаль з нязначнай клейкай, пасля вялікай колькасцю слізістагнойнай макроты. Хранічны Б. развіваецца з вострага. Яго сімптомы: прыступы кашлю (пераважна раніцай) з слізіста-гнойнай макротай, дыхавіца, сінюшнасць твару, рук і ног. Ускладненні: пнеўмасклероз, эмфізема лёгкіх, бронхаэктазія. Прафілактыка: барацьба з курэннем, забруджанасцю паветра, загартоўванне арганізма, фіз. культура. Лячэнне: сульфаніламідныя прэпараты, антыбіётыкі, адхарквальныя і ад кашлю сродкі, гарчычнікі, банкі (на спіну і грудзі), гарачае малако з содай, інгаляцыі; багатая на вітаміны ежа; пры хранічным Б. кліматычнае і курортнае лячэнне. На Б. хварэе ўся с.-г. жывёла, пераважна маладняк.

Літ.: Георгиевская Л. М. Бронхиты, у кн.: Многотомное руководство по внутренним болезням, т. 3, под ред. Е. М. Тареева. М., 1964; Аденский А. Спутник терапевта, Мн., 1964; Внутренние незаразные болезни сельскохозяйственных животных, 3 изд., М., 1967.

Р. П. Мацвяйкоў. Мінск.

БРАНХІЯЛЬНАЯ АСТМА, алергічная хвароба, якая характарызуецца прыступамі ўдушша ад спазмы бронхаў і ацёку іх слізістай абалонкі. Бывае ад павышанай адчувальнасці арганізма да розных (звычайна бясшкодных) рэчываў — алергенаў (гл. *Алергія*).

Літ.: Булатов П. К. Бронхиальная астма, Л., 1964.

БРАНЦАЎ Аляксандр Аляксандравіч [2(14).4.1883, Пецярбург — 30.9.1961], рускі савецкі рэжысёр. Нар. арт. СССР (1956). Чл. КПСС з 1943. Тэарэтык сав. т-ра для дзяцей. Вызначыў яго маст.-пед. прынцыпы. Заснавальнік і нязменны кіраўнік Ленінградскага т-ра юных гледачоў (з 1921). Пастаноўкамі п'ес «Канёк-Гарбунок» па казцы П. Яршова, «Выкрадальнік агню» П. Горлава, «Беднасць не загана» А. Астроўскага і «Цімошкаў рудпік» Л. Макар'ева вызначыў шляхі развіцця дзіцячага т-ра. Дзярж. прэмія СССР 1950. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Зельцер С., А. А. Брянцев, М., 1962.

БРАНЦАЎ Павел Дзмітрыевіч (1845 — год см. невяд.), рускі гісторык-манархіст. Выкладаў гісторыю і геаграфію ў Віленскім рэальным вуч., быў дырэктарам нар. вучылішчаў у Курляндскай губ. У 90-я г. 19 ст. супрацоўнічаў у «Виленском календаре» і «Виленском вестнике». Найбольш вядомы яго працы па гісторыі Вял. кн. Літоўскага. Гал. заслугай літоўска-беларускіх князёў лічыў іх барацьбу за праваслаўе. На яго думку, рус. цары выратавалі беларусаў і літоўцаў ад польскай асіміляцыі. Ухваляў Мураўёва-вешальніка за задушэнне паўстання 1863.

Тв.: История Литовского государства с древнейших времен, Вильна, 1889; Польский мятеж 1863 г., Вильна, 1891; Очерк древней Литвы и Западной России, 2 изд., Вильна, 1896; Восстание поляков в 1830—1831 гг., Вильна, 1896.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

БРАНЧЫЦЫ, вёска ў Чапялёўскім с/с Салігорскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Случ». За 13 *км* на Пн ад Салігорска, 127 *км* ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Калій 3-і. 673 ж., гасп. 210 (1970). Васьмігадовая школа, б-ка, мед. пункт, магазін. Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БРАНШТЭЙН Якаў Анатолевіч [30.10(10.11). 1897, г. Бельск Гродзенскай губ.— 2.5.1938], беларускі і яўрэйскі савецкі літ.-знавец і крытык. Чл.-кар. АН БССР (1936). Чл. КПСС з 1925. У 1919—21 у Чырв. Арміі. Скончыў 1-ы Маскоўскі ун-т (1925), аспірантуру БДУ. З 1932 праф. Мінскага пед. ін-та і навук. супрацоўнік Ін-та л-ры АН БССР. Пачаў друкавацца ў сярэдзіне 20-х г. Першы аб. крытычных арт. «Атака» (1930). Выдаў кн. «Праблемы ленінскага этапу ў літаратуразнаўстве» (1932), «Вынікі 15-гадовай барацьбы за марксізм-ленінізм у літаратуразнаўстве» (1932), «На замацаваных пазіцыях» (1934). Аўтар арт. пра А. Пушкіна, Я. Коласа, Я. Купалу, Дз. Фурманава, А. Александровіча, М. Кульбака, М. Лынькова, Я. Маўра, І. Харыка, І. Фефера.



БРАНЯ, ахоўныя абалонкі ці шчыты з бранявой сталі, лёгкіх металаў, паліморных матэрыялаў. У ваеннай справе — сродак засцярогі асабовага саставу і тэхнікі ад снарадаў, агню, радыеактыўнага і светлавога выпрамянення атамнага выбуху. У электратэхніцы Б. ўжываецца як ахоўная абалонка (напр., Б. кабелю).

Літ.: Бирюков В. С. Применение брони в военном деле, М., 1961.

БРАНЯНОСЕЦ, найбольш магутны ваенны карабель 2-й пал. 19 і пач. 20 ст. Падзяляліся Б. на лінейныя і берагавой абароны.


У Расіі першы Б. «Пётр Вялікі» пачалі будаваць на пецярбургскай верфі ў 1869; у 1872 прайшоў марскія выпрабаванні. Ён меў чатыры 305-міліметровыя гарматы і 15 меншага калібру. Бартавая браня дасягала таўшчыні 356 *мм*, водазмяшчэнне 10 тыс. *т*, скорасць 14,3 вузла. У рускім флоце Б. існавалі да руска-японскай вайны. У ліку апошніх спушчаных на ваду Б. быў «Князь Пацёмкін Таўрычаскі» (1904). У 1905 на ім успыхнула паўстанне матросаў. Пад чырв. сцягам каманда карабля перайшла на бок рэвалюцыі. З 1906 замест Б. пачалі будаваць караблі тыпу *дрэдноўтаў*.

БРАНЯПОЕЗД, браніраваны поезд з кулямётным і гарматным узбраеннем. Складаецца з бронелакаматыва (найчасцей ставіцца ў сярэдзіне саставу), бронепляцовак, кантрольных платформаў (яны засцерагаюць ад падрыву на мінах). У грамадзянскую і Айчынную войны Б. выкарыстоўваліся для аховы і абароны чыгуначных аб'ектаў і баявых дзеянняў у палосе чыгункі.

БРАНЯТАНКАВЫЯ І МЕХАНІЗАВАНЫЯ ВОЙСКІ, гл. *Танкавыя войскі.*

БРАС, спосаб спартыўнага *плавання.*

БРАСЛАЎ (летапісны Брачыслаўль), горад (з 1940), цэнтр Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. На паўн. беразе воз. Дрывяты. За 238 *км* на З ад Віцебска, 30 *км* ад чыг. ст. Друя. 4,6 тыс. ж. (1969).



Браслаў. Агульны выгляд.

Упершыню ўпамінаецца ў хроніцы М. Стрыйкоўскага пад 1065. Раскопкі паказалі, што В. узнік у пач. 9 ст. на месцы спаленага латгальскага паселішча. Названы імем полацкага кн. Брачыслава Ізяславіча (гл. *Брачыславы*), які, відаць, аднавіў Б. У 11—13 ст. пагранічны горад Полацкага княства. Стараж. гарадзішча — Замкавая гара — знаходзіцца на перашыйку паміж азёрамі Дрывяты і Навята. Калі 1248 за 50 км ад Б. магістр духоўна-рыцарскага ордена Эрнест пабудаваў крэпасць Дынабург. У пач. 14 ст. В. у складзе Полацкага княства ўвайшоў у Літоўскае. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у Расійскай імперыі. У складзе бурж. Польшчы (1921—39) — павятовы цэнтр Віленскага ваяводства.

Маслазавод, рыбны, агароднінасушыльны з-ды, хлебакамбінат, прамкамбінат, лясгас з дрэваапр. цэхам. Адзін з самых азелянёных гарадоў Беларусі. Паблізу Б. санаторый і турысцкая база. Сярэдняя, васьмігадовая, музычная школы, школа рабочай моладзі, 2 дашкольныя ўстановы; Дом культуры, 2 б-кі, кінатэатр, 4 клубы, бальніца, паліклініка, дыспансер. У гарадскім парку помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі пры вызваленні Браслаўшчыны ад гітлераўскіх захопнікаў.

БРАСЛАЎСКАЯ ГРАДА, частка Балтыйскай грады на крайнім ПнЗ БССР. Малады рэльеф Б. г. сфарміраваўся ў час валдайскага абледянення. Складаецца з марэнных градаў, якія ўсерадпадобна разыходзяцца на Пн, ПнУ і У, утвараючы высокія водападзелы паміж шматлікімі азёрамі. Уздоўж паўн. берага воз. Дрывяты і зах. берагоў азёраў Спуды і Струста пясчаныя ўзгоркі *(камы).* Пры абсалютных выш. каля 200 *м* Б. г. прыўзнята над узр. азёраў на 30—40 *м.* Унутр. частка сярэдняй грады (найвыш. пункт 210 *м*) — выпуклае плато з адноснымі выш. 12—15 *м.* На цэнтр. частцы Б. г. ворныя землі; лугі і лясы захаваліся паблізу азёраў, забалочаных паніжэнняў, на камах.

БРАСЛАЎСКІ РАЁН, у складзе Віцебскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на ПнЗ вобл., у міжрэччы Зах. Дзвіны і Дзісны. Пл. 2,2 тыс. *км²*. Нас. 51,1 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 12 сельсаветаў; 2 гар. пас.: Відзы і Друя. Цэнтр г. Браслаў.

Паверхня раёна вельмі разнастайная. У паўд. частцы — *Полацкая нізіна,* у цэнтр. і паўн.— марэнная *Браслаўская града* (пераважныя выш. 150—200 *м* над узр. м.). Амаль па ўсёй тэр. марэнныя грады і ўзгоркі чаргуюцца з глыбокімі азёрнымі катлавінамі, абмежаванымі лесам і балотам. Карысныя выкапні: радовішча торфу Бяльмонт — 8,8 млн. *т*; 5 радовішчаў цагельных глінаў — 2,2 млн. *м³* (у т. л. радовішчы Балойкі каля Браслава — 1,0 млн. *м³* і Казяны — 0,5 млн. *м³*); радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу Струста — 0,6 млн. *м³*. Сярэдняя т-ра студз. ад —6,5 да —7, ліп. 17—17,5 °С. Ападкаў 560 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 190 дзён. Браслаўшчыну паз. краем блакітных азёраў. Тут размешчана адна з вялікіх і своеасаблівых азёрных груп рэспублікі — Браслаўская (больш за 30 азёраў). Найбольшыя з іх: Дрывяты, Спуды, Струста, Волас, Несціш, злучаныя пратокамі. Усе ў басейне р. Друйкі. На мяжы з Літвой і Латвіяй азёры Дрысвяты і Рычы, на Пд — Богінскае, на У — Укля і інш. Азёры багатыя на рыбу (судак, мянтуз, шчупак, лешч, вугор, рапушка і інш.). Рэкі: Зах. Дзвіна на ПнУ,






Браслаўскі раён. Краявід паблізу в. Слабодка.

Дзісна (з прытокам Дрысвята) на Пд раёна. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (59,2%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (18,4%), тарфяна-балотныя (17,5%), пойменныя (3,3%) і інш. З мінер. глебаў 57,3% супясчаных, 32,6 супясчаных, 9,6 пясчаных, 0,5% гліністых. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 36 (цана бала 0,30 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 22, усіх с.-г. угоддзяў — 31. Пад лесам 25% тэр., пашыраны хвоя, елка, бяроза, асіна, вольха. Насяляюць раён беларусы, ёсць палякі, рускія, літоўцы, латышы. Сярэдняя шчыльн. 23 чал. на 1 *км²*. Гарадскога нас. 23%.

За гады Сав. улады створана прамысл. для перапрацоўкі мясцовай сыравіны. У Браславе маслазавод, агароднінасушыльны, рыбны з-ды, прамкамбінат, хлебакамбінат, камбінат быт. абслугоўвання, Міжкалгасбуд. У Відзах і паблізу в. Друйск цагельні; спірт. з-д (Відзы-Лаўчынскія), Браслаўскі торфабрыкетны з-д, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі ў в. Бяльмонты. ГЭС: «Дружба народаў» (300 *квт*), пабудаваная ў 1953 на р. Дрысвята, «Шлях да камунізма» (550 *квт*), Браслаўская (400 *квт*). Уваходзяць у Беларускую энергасістэму. У раёне 34 калгасы і 5 саўгасаў (1970).

Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Урбаны),* «Гвардыя» *(Казяны),* «Гігант» *(Купчалі),* імя Дзімітрова *(Пакульня),* імя Дзяржынскага *(Спрынды),* «Дружба» *(Рубеж),* імя Жданава *(Мяжаны),* «За мір» *(Дуброўка),* «Запаветы Ільіча» *(Дайблі),* імя Заслонава *(Опса),* «Зорка» *(Ельня),* «Іскра» *(Падручша),* імя Калініна *(Оплісса),* «Камунар» *(Карасіна),* «Кастрычнік» *(Жджэлі),* імя Кірава *(Цяцеркі),* імя Леніна *(Гайрылаўцы),* «Маяк» *(Пагошча),* імя Мічурына *(Богіна),* «Партызан» *(Замошша),* «Перамога» *(Вайнюнцы),* «Прагрэс» *(Быстрамаўцы),* «Праўда» *(Далёкія),* імя Пушкіна *(Эйвідавічы),* «Радзіма» *(Завер'е),* «Світанне» *(Літоўшчына),* «Слава» *(Плюсы),* імя Суворава *(Друйск),* «Уперад» *(Відзішкі),* імя Фрунзе *(Дварышча),* імя Чапаева *(Баруны),* імя Чарняхоўскага *(Ігказнь),* імя Чкалава *(Азярава),* «Шлях Леніна» *(Бяльмонты).* Саўгасы і іх цэнтры: «Авангард» *(Дрысвяты),* «Браслаўскі» *(Мяльні),* «Відзскі» *(Гірэйшы),* «Друйскі» *(Друя),* «Камуніст» *(Відзы-Лаўчынскія).*

На механізаваным таку ў саўгасе «Друйскі».



С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і льнаводстве. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 46% тэр. На пач. 1970 асушана 6,5 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная паслўная пл. (тыс. *га*, 1969) 66,6, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 28,6, тэхнічнымі 4,2, бульбай 8,3, кармавымі 25,2. На пач. 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 51,3 (у т. л. кароў 23,2), свіней 36,5, авечак і коз 10,8. Асн. від транспарту аўтамабільны. Найб. значэнне маюць шашэйныя дарогі ад Браслава на Відзы і Паставы, на Даўгаўпілс, Друю, Міёры.

У 1970 у раёне было 12 сярэдніх, 30 васьмігадовых, 78 пачатковых школ, 2 школы рабочай і 3 сельскай моладзі, школа-інтэрнат, муз. школа, 9 дашкольных устаноў, 2 прафесійнатэхн. вуч.; 53 клубныя ўстановы, 36 масавых б-к, 50 кінаўстановак, у т. л. 35 стацыянарных, 9 бальніц, урачэбна-амбулаторны ўчастак, 27 фельч.-ак. пунктаў, 2 санаторыі, турбаза «Браслаўскія азёры». На пач. 1970 у раёне працавала 406 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 23 інжынеры, 18 аграномаў, 24 заатэхнікі, 20 вет. урачоў, 258 настаўнікаў, 63 урачы; 1716 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Браслаўская звязда». *І. І. Трухан.* Мінск.

БРАСЛАЎСКІЯ АЗЁРЫ, агульная назва больш як 30 азёраў у бас. р. Друйкі (прыток Зах. Дзвіны), у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Найбольшыя — *Дрысвяты, Спуды, Струста, Волас, Войса, Несціш, Недрава, Бярэжа, Балойса, Поцех, Навята, Рака.*

БРАТАВАЯ (братава, браціха), братава жонка.

БРАТАЎКА (Melampyrum), род аднагадовых паўпаразітных раслін сям. залознікавых. Сцябло прамастойнае з валаскамі, выш. 8—70 *см.* Лісце лінейна-ланцэтнае. Кветкі бледна-жоўтыя або пурпуровыя з фіялетавым прыкветкам. Суквецце гронка- або коласападобнае. Вядома 35 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі і Паўн. Амерыцы. У СССР 16, на Беларусі 6. Найб. пашыраныя: Б. дуброўная (M. nemorosum, нар. назвы: мядунка, іван-ды-мар'я, іванец, брат з сястрою, дзвонец, дзень і ноч), Б. палявая (M. arvense) і Б. лясная (M. silvaticum). Расце Б. ў хвойных і мяшаных лясах, у хмызняках, на лугах, на полі як пустазелле. Б. дуброўная і Б. палявая маюць алкалоіды і ядавітыя гліказіды.



Братаўка дуброўная.

БРАТКАВА, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Авангард». За 21 *км* на ПдЗ ад Капыля, 138 *км* ад Мінска, 13 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 550 ж., двароў 140 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом куль-

туры, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі. Помнік на магіле трох невядомых сав. лётчыкаў, якія загінулі ў першы дзень Айч. вайны.

БРАТКІ, а н ю ц і н ы в о ч к і (Viola tricolor), адна- і двухгадовая травяністая расліна сям. фіялкавых. Сцябло выш. да 40 *см*. Прыкаранёвае лісце круглавата-сэрцападобнае, сцябловае — ланцэтападобнае. Кветкі стракатыя: верхнія пялёсткі фіялетавыя, бакавыя жоўтыя, ніжні пялёстак двухколерны, крыху махрысты, са шпоркай. Дзіка растуць у Еўропе, М. Азіі, Паўн. Амерыцы (на лугах, лясных палянах, каля дарог, у пасевах як пустазелле). На Беларусі нар. назвы: брат з сястрою, трава трыцветная, трайцвет, махвіцы. Родапачынальнікі садовых формаў і сартоў у кветкаводстве. Расліна мае вітамін С, карацін, руцін.



БРАТНІ САЮЗ ЛІТОЎСКАЙ МОЛАДЗІ, тайная арганізацыя, якая існавала на Беларусі і ў Літве ў 1846—49. Заснаваны ў Вільні збяднелымі шляхціцамі Ф. *Далеўскім* і А. *Далеўскім*. Спачатку яднаў вучнёўскую моладзь. Члены саюза ставілі задачы быць справядлівымі, паважаць людзей незалежна ад іх веравызнання і нацыянальнасці, садзейнічаць паляпшэнню становішча сялян і нац.-вызв. барацьбе польскага народа. Рэвалюцыйны 1848 г. стаў паваротным для саюза. У саюз уліліся выхадцы з сац. нізоў — рамеснікі, разначынцы, аднадворцы, дробная шляхта. У ідэйную праграму саюза ўключаны патрабаванні ліквідацыі ўсіх саслоўных прывілеяў, вызвалення сялян і надзелу іх зямлёй, вызвалення Польшчы і абвяшчэння яе рэспублікай. Ідэолаг радыкальнага кірунку А. Янкоўскі, падзяляючы погляды Ю. *Бакшанскага*, лічыў неабходным развіваць антышляхецкі і антыцарысцкі сялянскі рух. Прадстаўнікам рэвалюц.-дэмакр. тэндэнцый унутры саюза процістаялі ўмераныя. Найбольш плённую дзейнасць саюз развівае ў перыяд падрыхтоўкі паўстання (канец 1848 — сак. 1849). Ён аб'ядноўваецца з канспіратыўнай арг-цыяй з цэнтрам у Мінску. Члены саюза вялі рэвалюц. агітацыю ў Гродне, Лідзе, Навагрудку, Слоніме і інш. гарадах Беларусі і Літвы, спрабавалі залучыць на свой бок салдатаў Бабруйскай крэпасці і Мінскага гарнізона. У фальварку Бараўляны пад Мінскам наладжваецца адліўка куляў. Пад націскам прыхільнікаў рашучых дзеянняў назначаны тэрмін паўстання — у ноч на 5 крас. 1849. Але 27 сак. пачаліся арышты сярод рамеснікаў Вільні, што было пачаткам разгрому саюза. Да следства прыцягнута каля 200 чал. Кіраўнікі і найбольш актыўныя члены саюза прыгавораны да пакарання смерцю, заменена катаржнымі работамі ад 10 да 15 гадоў. Некаторых папярэдне праганялі праз строй. Астатнія члены Б. с. л. м. засуджаны на розныя тэрміны катаргі або аддадзены ў салдаты. Рэпрэсіі не прымусілі членаў саюза здрадзіць сваім ідэалам. Многія з іх удзельнічалі ў паўстанні 1863.

Літ.: С м и р н о в А. Ф. Революционные связи народов России и Польши, М., 1962, с. 127—140; F a j n h a u z D. Ruch konspiracyjny na Litwie i Białorusi 1846—1848, Warszawa, 1965, s. 264—333; M e r k y s V. Dalevskių šeima, Vilnius, 1967.

Н. М. Махнач. Мінск.

БРАТЧЫКАЎ Генадзь Іванавіч [7(20).3.1914, в. Міхееўка Салікамскага пав. Пермскай губ.— 10.12.1944], савецкі разведчык, у Айч. вайну дзейнічаў на Беларусі. Герой Сав. Саюза (1945). З служачых. Чл. КПСС з 1940. У Чырв. Арміі з ліст. 1932. Скончыў Ваен. вуч. сувязі (1936). У сак. 1943 на чале групы разведчыкаў закінуты ў тыл ворага, каб здабыць звесткі пра фаш. гарнізоны ў Шчорсе, Чарнігаве, Навазыбкаве, Гомелі, пра перамяшчэнне войск і баявой тэхнікі ворага па чыгунках Гомель — Бахмач, Гомель — Чарнігаў. Са снеж. 1943 група на чале з Б. вяла разведку варожых войск у Баранавічах, Ваўкавыску, Слоніме, Бярозе-Картузскай, Ружанах, Івацэвічах. За студз.— люты 1944 група Б. перадала ў штаб 1-га Бел. фронту больш за 70 данясенняў. З 10.9.1944 разведчыкі дзейнічалі ў польскіх гарадах Млава, Плоньск, Рыпін, Цяханаў. Б. загінуў у баі. На яго магіле ў мяст. Бежунь (ПНР) помнік.



БРАЎКІ, вёска ў Слабадскім с/с Мінскага р-на. Цэнтр калгаса імя Тэльмана. За 17 *км* на ПнУ ад Мінска. 104 ж., двароў 26 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БРАЎН (Brown) Джон (9.5.1800—2.12.1859), барацьбіт за вызваленне неграў у ЗША, адзін з лідэраў абаліцыянісцкага руху (гл. *Абаліцыянізм*). Дробны фермер. Аўтар антырабаўладальніцкіх памфлетаў, праекта «Часовай канстытуцыі», якая прадугледжвала ліквідаваць рабства і няроўнасць неграў з белымі. З 5 сынамі ўдзельнічаў ва ўзбр. барацьбе ў Канзасе супраць рабства. Рыхтаваў усеагульнае паўстанне неграў-рабоў. Для гэтага вывучаў ваен. справу, вопыт партыз. барацьбы ў горах, выз. вайну неграў у Гаіці, у Еўропе знаёміўся з месцамі напалеонаўскіх бітваў. У 1859 захапіў арсенал у Харперс-Феры (штат Віргінія),



у баі загінулі 2 сыны Б. Сам ён, цяжка паранены, трапіў у палон і быў пакараны смерцю. Расправа з Б. выклікала глыбокае абурэнне ў краіне. У пісьме да Ф. Энгельса К. Маркс назваў барацьбу амер. рабоў, пачатую пасля смерці Б., самай значнай, побач з рухам прыгнечаных у Расіі, падзеяй у свеце таго часу (К. М а р к с и Ф. Э н г е л ь с. Соч., т. 30, с. 4). Песня пра Б. была ваен. гімнам арміі Поўначы ў час грамада. вайны ў ЗША 1861—65.

Літ.: Д ю б у а У. Джон Браун, пер. с англ., М., 1960.

БРАЎН Мікалай Леапольдавіч [н. 2(15).1.1902, в. Парахіна Тульскай губ.], рускі савецкі паэт. Скончыў Ленінградскі пед. ін-т (1929). Друкуецца з 1924. Аўтар аб. вершаў «Свет і майстар» (1926), «Вернасць» (1936), «Марская слава» (1945), «Зямля ў квецені» (1955), «Вершы» (1962), «Я палю касцёр» (1966) і інш. Перакладаў творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, П. Глебкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, М. Лужаніна, В. Таўлая і інш. бел. паэтаў.

Тв.: Гимн одержимым, Л., 1967; Стихотворения, Л., 1968; бел. пер. у кн.— Паэты Ленінграда, Мн., 1948; Руская савецкая паэзія, Мн., 1953.

БРАЎНШТЭЙН Аляксандр Яўсеевіч [н. 13(26).5.1902, Харкаў], савецкі біяхімік. Акад. АН СССР (1964), правада. чл. АМН СССР (1945). З 1960 кіраўнік лабараторыі хім. асноў біял. каталізу ў Ін-це малекулярнай біялогіі АН СССР. Даследаваў працэсы абмену амінакіслот, бялкоў і інш. азоцістых злучэнняў, ролю некат. вітамінаў у гэтых працэсах, хімію ферментаў. Адкрыў працэс ферментатыўнага пераамініравання амінакіслот і яго біял. ролю; распрацаваў новыя ўяўленні пра гал. шляхі асіміляцыі і дысіміляцыі азоту ў жывёльных арганізмах. Даследаванні Б.— навук. аснова для вырашэння праблем харчавання чалавека і жывёл, прыроды дзеяння некат. антыбіётыкаў, лекавых рэчываў і інш. Дзярж. прэмія СССР 1941.



Тв.: (Разам з Крыцман М. Р.) Образование аминокислот путем интермолекулярного переноса аминогруппы, «Биохимия», 1937, т. 2, в. 2; Биохимия аминокислотного обмена, М., 1949; Функции витамина B_6 в процессах обмена аминокислот, «Успехи современной биологии», 1953, т. 35, в. 1; Главные пути ассимиляции и диссимиляции азота у животных, М., 1957.

БРАЎЭР, Б р о ў в е р (Brouwer) Адрыян (1605 ці 1606, Аўдэнардэ — 1.2.1638), фламандскі жывапісец. Майстар бытавога жанру і пейзажа. Вучыўся ў Ф. Халса ў Харлеме. З 1631 жыў у Антверпене. Галандскае жанравае мастацтва зрабіла ўплыў на тэматыку карцін Б. Улюбёныя сюжэты — сцэны з нар. быту («Бойка сялян у час гульні ў карты», «Сяляне гуляюць у карты», 30-я г.; «Сцэна ў шынку», каля 1632; «Курцы», каля 1636—38; «Горкі напітак», «Бойка сялян у час гульні ў косці»). Карціны вызначаюцца сарказмам, гратэскавасцю вобразаў, манументальнай і ўраўнаважанай кампазіцыяй, трывожным каларытам. Сярод пейзажаў: «Дзюны», «Пейзаж з усходам месяца» і інш. Б.— адзін з лепшых каларыстаў 17 ст.



БРАХІАНТЫКЛІНАЛЬ (грэч. brachýs кароткі + *анты...* + klinō нагінаю), кароткая антыкліналь складка слаёў горных парод, восевая лінія (шарнір) якой хутка апускаецца ў процілеглых напрамках. Выхады пластоў на размытай паверхні маюць форму эліпсаў з больш стараж. пародамі ў цэнтры і маладымі па краях. Падзенне пластоў накіравана ад цэнтра ва ўсе бакі. Калі форма Б. набліжаецца да акружнасці, Б. наз. купаламі. Трапляюцца ў асадкавым чахле платформаў (асабліва ў прагінах).

БРАХІСІНКЛІНАЛЬ (ад грэч. brachýs кароткі+synklinō нагінаюся), кароткая сінклінальная складка слаёў горных парод. У плане мае авальную форму з падзенне пластоў ад краёў да цэнтра. Найбольш маладыя пароды выходзяць на паверхню ўнутры складкі, а больш старажытныя звонку. Б., блізкія да формы акружнасці, наз. чашай або мульдай (пры значных памерах).

БРАХІЯПОДЫ, п л е ч а н о г і я (Brachiopoda), тып беспазваночных жывёл. Вядомы з раннекембрыйскай эпохі. Выкапнёвых Б. 7 тыс. відаў, сучасных каля 200. Даўж. да 10 *см*. Водныя, пераважна марскія, прымацаваныя формы *(бентас)*. Цела мяккае, месціцца ў дзвюхстворкавай ракавіне рознастайнай формы. Паверхня ракавін гладкая або рабрыстая, з шыпамі і складкамі. У СССР Б. пашыраны ў паўн. і далёкаўсходніх морах. Выкапнёвыя Б. — кіравальная фаўна для стратыграфіі падраздзелаў сілуру, дэвону, карбону, пермі і часткова юры.

БРАХМАНІЗМ, рэлігія раннерабаўладальніцкага грамадства Індыі, якая змяніла ў пачатку 1-га тысячагоддзя да н. э. першабытныя (ведычныя) вераванні. Б. абвяшчаў, што навакольнае асяроддзе—здань («майя»), якая народжана дзейнасцю безасабовай боскай субстанцыі (сусветнага духу) — Брахмы. Паводле гэтай рэлігіі душа чалавека пасля яго смерці перасяляецца ў новую абалонку. Калі людзі пакорліва выконвалі свае абавязкі па касце, яны маглі спадзявацца на больш высокае пераўвасабленне, аж да брахмана (жраца); парушальнікі ж пераўвасобяцца ў больш нізкія істоты, нават у жывёлу ці насякомае. Тым самым адказнасць за пакуты працоўных Б. перакладваў на іх самі і вучыў цярплівасці і паслухмянаму выкананню павіннасцей, ускладзеных на іх пануючымі

класамі. Б. абараняў сац. няроўнасць і падзел гр-ва на саслоўі. Самыя важныя догматы Б. ляглі ў аснову *індуізму*.

Літ.: Ильин Г. Ф. Религия древней Индии, М., 1959. *Р. В. Грабеннікаў.* Мінск.

БРАХМАПУТРА (Брамапутра, на тэр. Кітая — Мацанг, Цангпо, Дыханг), рака ў Кітаі, Індыі, Усх. Пакістане. Даўж. 2900 *км*. Пл. бас. 935 тыс. км². Пачынаецца на ПдЗ Тыбецкага нагор'я на выш. 4864 *м* з ледавікоў хр. Ладакх. Цячэ ў тэктанічнай упадзіне Паўд. Тыбета, перасякае ўсх. працяг Гімалаяў і выходзіць на Інда-Гангскую раўніну. Упадае ў Бенгальскі заліў, утвараючы з р. Ганг дэльту (пл. 100 тыс. км²). Жыўленне снегавое і дажджавое. У летне-вясенні перыяд многаводная ад расталага снегу і ледавікоў у Гімалаях і ад мусонных дажджоў; узровень вады ў ніжнім цячэнні падымаецца на 10—12 *м*. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 12 100 *м*³/*сек*. Мае велізарныя гідраэнергетычныя рэсурсы. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная ад вусця да г. Дыбругарх (1290 *км*).



Сярэбраная браціна. 17 ст.

БРАЦІНА, старадаўняя драўляная або медная шарападобная пасудзіна. Служыла і памінальным кубкам. У царскіх і баярскіх палацах Б. былі з золата, серабра, упрыгожва л і с я кашт. камянямі, узорам. З 19 ст.— дэкар. пасудзіна.

БРАЦІСЛА́ВА (Bratislava), сталіца Славацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, адзін з найбуйнейшых гарадоў Чэхаславакіі. На берагах Дуная каля перакрыжавання гандл. шляхоў, паблізу ад граніцы Чэхаславакіі з Аўстрыяй і Венгрыяй. Рачны порт, важны чыг. вузел. 277 тыс. ж. (1967). Развіта маш.-буд., хім., нафтаперапр., тэкст., харч. прамысловасць. Вял. нафтаперапр. з-д, з-д штучнага валакна, якія выкарыстоўваюць нафту, што паступае з СССР па нафтаправодзе «Дружба». Вытворчасць кабелю, радыёапаратуры, станкоў. У цэнтры Б.— стары горад з крамлём (градам) 13—15 ст. Вакол старога горада — новыя раёны, паркі. Сярод арх. помнікаў: замак (12—18 ст., згарэў у 1811, рэстаўраваны), сабор св. Марціна (1221—1487) з капэлай св. Яна (1732), ц. кларысак (канец 14 ст.), ц. францысканцаў (13—14 ст.), вароты св. Тройцы (1715—25, з фрэскамі А. Бібіены), ц. св. Лізаветы (18 ст.), шматлікія мураваныя жылыя дамы і палацы 17—18 ст. Сучасныя арх. збудаванні: новы корпус Славацкага політэхн. ін-та (1964, арх. М. Кусы), школа для сляпых дзяцей (1961, сграфіта з керамікай, М. Шымурда) і інш. Славацкая АН, ун-т, політэхн., эканам., маст. і тэатральны ін-ты, Славацкая нац. галерэя.

Помнік савецкім воінам на гары Славін у Браціславе.



БРАЦК, горад абл. падпарадкавання ў Іркуцкай вобл. РСФСР. Рачны порт на Ангары, чыг. ст., аэрапорт. 155 тыс. ж. (1970). Прамысл. і энерг. цэнтр Усх. Сібіры, вырас у сувязі з буд-вам Брацкай ГЭС; прадпрыемствы лясной прамысл. Адзін з найбольшых у свеце лесапрамысл. комплексаў. Алюмініевы з-д, мяса-малочная прамысловасць. Агульнатэхн. ф-т Іркуцкага політэхн. ін-та, тэхнікум цэлюлозна-папяровай і дрэваапр. прамысл., мед., пед. вучылішчы. Тэатр лялек.

БРАЦКІЯ ШКОЛЫ, навучальныя ўстановы, якія ствараліся *брацтвамі*. У 16—17 ст. адыгралі важную ролю ў развіцці асветы на Беларусі і Украіне, служылі сродкам барацьбы бел. і ўкр. народаў супраць засілля каталіцкай царквы, за нац. незалежнасць. Былі адкрыты ў Вільні (1585), Брэсце (1591), Магілёве (1590—92), Мінску (1612), Пінску, Львове, Кіеве, Луцку і інш. гарадах. Дзейнасць Б. ш. кантралявалі прызначаныя брацтвамі «дазорцы школьныя». На чале школы стаяў рэктар, настаўнікі наз. «дыдаскаламі» ці «бакалярамі» і выбіраліся на сходзе брацтва. Б. ш. мелі 3—5 класаў, былі агульнасаслоўныя. Віленская і магілёўская — бясплатныя. Мелі свой статут. Ён вызначаў змест і арг-цыю навучання, якое выходзіла за межы *«сямі вольных мастацтваў»*. Вывучаліся славянская, грэч., лац., польская, бел. і ўкр. мовы, граматыка, дыялектыка, рыторыка, творы Платона, Эпікура, Арыстоцеля і інш. ант. мысліцеляў; «піітыка» (майстэрства вершаскладання) і музыка. Вучні набывалі і некат. веды па арыфметыцы, геаметрыі, астраноміі, геаграфіі. Пед. сістэма Б. ш. фарміравалася пад пэўным уплывам гуманіст. і рэфармацыйных ідэй. Гэта дало свой вынік — многія вучні сталі потым вядомымі настаўнікамі, вучонымі, грамадскімі дзеячамі, аўтарамі школьных падручнікаў, палемічных твораў, накіраваных супраць уніі і каталіцызму. Настаўнікамі ў Б. ш. былі С. *Зізаній* і Л. *Зізаній*, М. *Сматрыцкі*, Л. *Карповіч*, С. *Косаў* і інш. Б. ш. Беларусі падтрымлівалі цесную сувязь са школамі Украіны, з рус. асветнікамі і друкарамі. Некаторыя Б. ш. запрашалі да сябе настаўнікаў кальвінісцкіх (пратэстанцкіх) школ.

Літ.: Гл. пры арт. *Брацтвы.*

С. А. Падокшын. Мінск.

БРАЦТВЫ, 1) рэлігійна-нацыянальныя арганізацыі беларускага і ўкраінскага праваслаўнага гарадскога насельніцтва ў 16—18 ст. Адыгралі важную ролю ў барацьбе супраць каталіцтва і паланізацыі. На Беларусі першыя Б. ўзніклі ў 2-й пал. 16 ст., у канцы 16 — пач. 17 ст. існавалі ва ўсіх вял. гарадах (Мінск, Магілёў, Брэст, Гродна, Полацк, Віцебск, Слуцк, Пінск, Орша і інш.). У некат. гарадах было па некалькі Б., у Мінску ў сярэдзіне 17 ст. — 7. Ствараліся звычайна пры цэрквах ці манастырах. У Б. ўваходзілі пераважна рамеснікі, гандляры, а таксама духавенства і шляхта, якім належала кіруючая роля. Фін. сродкі складаліся з уступных і членскіх узносаў, памеры якіх залежалі ад заможнасці і пажадання «братчыка». Гэта спрыяла ўступленню ў Б. шырокіх колаў гарадскога насельніцтва. Займаліся рэліг.-дабрачыннай дзейнасцю, будавалі цэрквы, дамы прытулку, памагалі збяднелым «братчыкам», сіротам. З канца 16 ст. актыўна змагаюцца супраць гвалтоўнай паланізацыі, акаталічвання, уніі і гэтым самым аб'ектыўна вядуць барацьбу супраць нац. прыгнёту, абараняюць мову і культуру бел. народа. Пад уплывам Б. насельніцтва гарадоў байкатавала уніяцкіх свяшчэннікаў, не падпарадкоўвалася каралеўскім чыноўнікам. Магістраты Мінска ў 1609 і Магілёва ў 1619 адмовіліся прызнаваць уніяцкіх мітрапалітаў. Б. Вільні, Віцебска, Магілёва, Оршы і Полацка падрыхтавалі выступленне супраць І. Кунцэвіча (гл. *Віцебскае паўстанне 1623*). Адначасова Б. вялі культ.-асвет. дзейнасць, адкрывалі школы, якія былі найважнейшым сродкам ідэалагічнай барацьбы супраць каталіцтва (гл. *Брацкія школы*). У друкарнях Б., акрамя царкоўных кніг, выдаваліся падручнікі, навуч. дапаможнікі і т. зв. «мяцежніцкія» антыкаталіцкія рэліг.-палемічныя творы. Б. выступалі супраць неабмежаванай улады і праваслаўных царк. феадалаў, дамагаліся выбарнасці свяшчэннікаў, кантролю над царк. сродкамі, таннай платы за службу. Дзейнасць Б. адыграла станоўчую ролю ў барацьбе з каталіцтвам і нац. прыгнётам, садзейнічала ўмацаванню сувязей Беларусі і Украіны з Рус. дзяржавай. Аднак з узмацненнем залежнасці Вял. кн. Літ. ад Польшчы сярод бел. феадалаў і гарадскіх вярхоў пашырылася імкненне да каталіцтва і уніяцтва як сродкаў захавання і ўмацавання сваіх эканам., саслоўных і літ. пазіцый. Уніяты і езуіты пры падтрымцы магнатаў і каралеўскіх улад перашкаджалі дзейнасці Б., рабілі пагромы брацкіх школ, дамагаліся, каб іх закрыць, што значна аслабіла сілы Б., асабліва ў Зах. Беларусі. Але пад уплывам Б. большасць сялян і гараджан, дробнамаляткоўвыя і сярэднія феадалы паранейшаму аставаліся ў апазіцыі да каталіцтва і уніі. З канца 18 ст., з уз'яднаннем Беларусі з Расіяй і выцясненнем каталіцтва, Б. закрываюцца. 2) У сярэднія вякі Б. наз. аб'яднанні гарадскіх рамеснікаў (часам сялян). Упершыню ўзніклі ў 14 ст., пераважна ў гарадах Францыі, Англіі, Германіі. З 16 ст. становяцца цэнтрамі, якія кіравалі класавай барацьбой чаляднікаў. У Францыі перасталі існаваць у канцы 18 ст., у іншых краінах — разам з цэхамі. 3) У 17—18 ст. Б. наз. купецкія арг-цыі ў рамесна-гандлёвых цэнтрах Беларусі. Яны ядналі розныя катэгорыі гандл. насельніцтва, кіруючая роля належала буйным купцам. Б. імкнуліся ўстанавіць на гарадскім рынку манаполію для сваіх заможных членаў, абмяжоўвалі гандаль купцоў з інш. гарадоў, шляхты, духавенства, гарадскіх рамеснікаў.

Літ.: Папков А. А. Братства. Очерк истории западнорусских православных братств, Троицко-Сергиевская лавра, 1900; Флеров И. О православных церковных братствах, противоборствовавших унии в Юго-Западной России в XVI, XVII и XVIII столетиях, СПб., 1857; Савич А. Нарис з історії культурних рухів на Україні та Білорусі в XVI—XVIII вв., Київ, 1929; Медынский Е. Н. Братские школы Украины и Белоруссии в XVI—XVII вв. и их роль в воссоединении Украины с Россией, М., 1954; Харлампович К. Западнорусские православные школы XVI и начала XVII в., Казань, 1898; Ботвинник М. Б. У истоков учебной книги, Мн., 1964.

В. І. Мялешка. Мінск.

БРАЦЬКАВІЧЫ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Дзяражня. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Брацкі». За 23 *км* на З ад Касцюковіч, 183 *км* ад Магілёва, 27 *км* ад чыг. ст. Камунары, на шашы Касцюковічы — Краснаполле. 533 ж., двароў 159 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны, швейная майстэрня. Мемарыяльная сцяна на ўшанаванне памяці жыхароў Б., якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. На месцы зімовай базы партыз. атрада «За Радзіму» адноўлена зямлянка, устаноўлены помнік і мемарыяльная дошка ў памяць партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БРАЧЫСЛАВЫ, князі Полацкай зямлі 10—13 ст.

Б. Ізяславіч (г. н. невяд.— п. 1044), полацкі князь [1003—1044], сын кн. Ізяслава Уладзіміравіча, унук Рагнеды і Уладзіміра Святаславіча. Апіраючыся на эканам. і ваен. сілу Полацка, імкнуўся расшырыць тэр. Полацкага княства. Пры ім палачане далучылі землі паміж Зах. Дзвіной і Дзісной, дзе вырас г. Брачыслаўль (Браслаў). У 1021 зрабіў паход на Ноўгарад, але па дарозе назад разбіты на р. Судаміры (Судоме) *Яраславам Мудрым*. Паводле заключанага праз год міру атрымаў ва ўладанне Віцебск і Усвяты.

Б. Давыдавіч (г. н. і см. невяд.), князь ізяслаўскі і лагожскі, сын полацкага кн. *Давыда Усяславіча*. Жанаты з дачкой кіеўскага кн. Мсціслава Уладзіміравіча. Упамінаецца ў летапісе пад 1127, калі Мсціслаў Уладзіміравіч пайшоў вайной на крывічоў за іх адмову ўдзельнічаць у паходзе супраць полаўцаў.

Войскі Б. Д. былі акружаны пад Лагожскам, і князь трапіў у палон да свайго швагра Ізяслава Мсціславіча.

Б. Васількавіч (г. н. і см. невяд.), князь ізяслаўскі і віцебскі, сын полацкага кн. Васількі Рагвалодавіча. У 1158 атрымаў у княжанне Ізяслаўль (Заслаўе) ад полацкага кн. Рагвалода Барысавіча. У 1159 з братам Валодшам узяты ў палон мінскімі князямі Глебавічамі і зняволены ў Мінску, адкуль яго вызваліў Рагвалод Барысавіч. У 1162 з інш. полацкімі князямі ваяваў супраць дарагабужскага кн. Уладзіміра Мсціславіча за Слуцк. У 1180, калі быў князем віцебскім, з кіеўскім кн. Святаславам Усеваладавічам і чарнігаўскімі князямі ваяваў супраць смаленскіх Расціславічаў. Упамінаецца ў «Слове аб палку Ігаравым».

У 30-я г. 13 ст. летапіс расказвае пра полацкага кн. Б., якога гісторыкі лічаць апошнім з дынастыі полацкіх Ізяславічаў. Жыў у Віцебску. Выдаў сваю дачку Аляксандру (паводле В. М. Тацішчава — Праскоўю) замуж за князя Аляксандра Неўскага. Вяселле адбылося ў 1239 у Таропцы.

Літ.: Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 1 (т. 1—2) — 2 (т. 3—4), М., 1962—63; Даниленич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV ст., Киев, 1896; Насонов А. Н. «Русская земля» и образование территории древнерусского государства, М., 1951.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

БРАШУРА (франц. brochure ад brocher сшываць), неперыядычнае друкаванае выданне памерам ад 5 да 48 старонак, не лічачы вокладкі, тытула і інш.

БРАШЭВІЧЫ, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. За 12 *км* на ПнЗ ад Драгічына, 100 *км* ад Брэста, 5 *км* ад чыг. ст. Драгічын. 1045 ж., двароў 320 (1970). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, 3 магазіны. У часы бурж. Польшчы ў Б. дзейнічала падпольная ячэйка КПЗБ. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. акупанты загубілі 82 жыхароў. Каля вёскі 2 курганы часоў Кіеўскай Русі.

БРАЯНКОЎ Віктар Міхайлавіч [н. 2(15).9.1914, Самара], беларускі савецкі віяланчэліст. Засл. арт. БССР (1955). Скончыў Бел. кансерваторыю (1941). З 1940 працуе ў аркестры Бел. т-ра оперы і балета, у 1946—57 канцэртмайстар групы віяланчэляў, з 1960 намеснік канцэртмайстра.

БРЖЭСКІ Вітольд Часлававіч [н. 12(25).11.1913, с. Рутанка Чарнігаўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне сацыяльнай гігіены і аховы здароўя. Д-р мед. н. (1969). Чл. КПСС з 1960. У 1936 скончыў 1-ы Ленінградскі мед. ін-т. Працаваў урачом у РСФСР (1936—60) і адначасова займаўся навук. дзейнасцю. З 1961 заг. кафедры сац. гігіены, арг-цыі аховы здароўя і гісторыі медыцыны Гродзенскага мед. ін-та. Асн. працы па абагульненні навук. дзейнасці практычных дактароў і па гісторыі хірургіі.

Тв.: Земская хирургия, «Клиническая хирургия», 1963, № 12; Влияние съездов земских врачей на развитие земской хирургии, «Клиническая медицина», 1966, № 10; Роль губернских земских больниц в организации медицинской помощи населению, «Советское здравоохранение», 1968, № 1.


БРОДАЎКА, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., на р. Бродня. Цэнтр сельсавета. За 20 *км* на Пн ад Барысава, 101 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Барысаў. 318 ж., гасп. 108 (1970). Сярэдняя школа, фельч.-ак. пункт, магазін.

БРОДНА, возера ў бас. р. Нешчарды, правага прытока Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,55 *км*². Даўж. 1,5 *км*, найбольшая шыр. 0,6 *км*, сярэдняя 0,3 *км*. Катлавіна круглявая. Вадазбор (3,75 *км*²) узгорыста-марэнны. Злучана канавай з воз. Нешчарда. Б. эўтрофнага тыпу. Водзяцца шчупак, акунь, плотка; гусцяра.


БРОДНІЦА, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Бродніцкі». За 12 *км* на У ад Іванава, 144 *км* ад Брэста, 3 *км* ад чыг. ст. Юхнавічы. 747 ж., двароў 225 (1970). Спіртавы з-д, лясніцтва, швейная майстэрня. Пач. школа, клуб. б-ка, бальніца, урачэбны ўчастак, аптэка, дзіцячы сад, адда. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Абеліск сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БРОДНЯ, рака, правы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 33 *км*. Цячэ па паўд. ускраіне Верхнебярэзінскай нізіны, у Барысаўскім і Смалявіцкім р-нах Мінскай вобл. Вадазбор (214 *км*²) у верхняй частцы — платопадобная марэнная раўніна, у ніжняй — пясчаная водналедавіковая раўніна. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,4 *м*³/*сек*.

БРОДСКІ Ісак Ізраілевіч [25.12.1883(6.1.1884), с. Сафіеўка на Украіне — 14.8.1939], рускі савецкі жывапісец і графік. Засл. дз. маст. РСФСР (1932), праф. (1934). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1902—08) у І. Рэпіна. Удзельнічаў у рэвалюц. руху 1905, прысвяціў гэтым падзеям карціну «Чырвонае пахаванне» (1906, была забаронена цэнзурай), друкаваў паліт. карыкатуры ў сатыр. часопісах. У 1911—17 пісаў пераважна пейзажы («Зіма», «Летні сад»), а таксама партрэты (Л. М. Бродскай і інш.). З 1904 удзельнічаў у выстаўках «Свету мастацтва», «Саюза рус. мастакоў», перадвіжнікаў і інш. У першыя гады пасля Кастр. рэвалюцыі актыўна ўдзельнічаў у станаўленні рэаліст. сав. мастацтва. У 1923 уступіў у Асацыяцыю мастакоў рэвалюц. Расіі. Тэма яго творчасці — рэвалюцыя і вобраз У. І. Леніна. Найб. вядомыя шматфігурныя гістар. карціны «Расстрэл 26 бакінскіх камісараў» (1925), «Выступленне У. І. Леніна на мітынгу рабочых Пуцілаўскага завода ў маі 1917 года» (1929),



Бронза. 1. Шыва танцуе. Паўд. Індыя. 13 ст. (?). **2.** Посуд тыпу «куанг». Кітай. 1027—900 да н. э. **3.** Трыножнік з Геркуланума. 1 ст. **4.** Галоўка Ніке. Афіны. 5 ст. да н. э. **5.** Бронзавы вадаліў нямецкай работы з посуду Барысаглебскай царквы ў Гродне. Пачатак 13 ст. **6.** Камода работы А. Дэлорма. Францыя. 1750. **7.** Паўфігура цара. Іфе. 12—14 ст. **8.** Сакрэтнік работы В. Бенемана. Францыя. Апошняя чвэрць 18 ст. **9.** Помнік А. Пушкіну ў Ленінградзе. Скульптар М. К. Анікушын. 1957.



Бронзавы век. 1. Сякера. Камень. Басейн Сажа. 2. Сякера; в. Пескі Мастоўскага раёна. 3. Матыка. Камень; в. Гарочычы Калінкавіцкага раёна. 4. Кельт. Бронза; в. Бердыж Чачэрскага раёна. 5. Сякера. Бронза; в. Хадосавічы Рагачоўскага раёна. 6. Наканечнік кап'я. Бронза; могільнік Стрэліца каля в. Рудня Шлягінская Веткаўскага раёна. 7. Кінжал. Крэмень; Брэсцкі раён. 8. Булава. Камень; г. п. Клічаў. 9. Падвеска. Бурштын; в. Хадосавічы Рагачоўскага раёна. 10. Дыядэма. Медзь; могільнік Стрэліца. 11. Гаршчок; в. Краснае Сяло Ваўкавыскага раёна. 12. Чаша; могільнік Стрэліца. 13. Гаршчок; могільнік Стрэліца.

«У. І. Ленін у Смольным» (1930). Аўтар партрэтаў М. В. Фрунзе (1929), С. М. Кірава (1935), М. Горкага (1937) і інш. Яго работам уласціва яснасць кампазіцыйнага рашэння, дакументальнасць, дакладнасць і строгасць малюнка, дэталізацыя формы. У пейзажах сав. часу — індустр. тэмы («Днепрабуд», 1930, і інш.). У 1934—39 дырэктар Усерасійскай АМ. У Ленінградзе музей-кватэра Б. Узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: Бродский И. А. Исаак Израилевич Бродский. Статьи, письма, документы, М., 1956.

БРОЖА, пас. у Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Брожка. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Бабруйск — г. п. Акцябрскі. За 25 *км* на Пд ад Бабруйска, 140 *км* ад Магілёва. 630 ж., дварoў 200 (1970). Лесаўчастак Бабруйскага леспрамгаса, лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання, пякарня. Сярэдняя і пач. школы, 2 клубы, б-ка, дзіцячы сад-яслі, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 2 магазіны; 2 помнікі — 380 савецкім воінам і 2 героям-лётчыкам, якія загінулі ў Айч вайну.

БРОЙЛЬ, Дэ Бральі (Broglie) Луі дэ (н. 15.8.1892), французскі фізік, адзін з заснавальнікаў квантавай механікі. Чл. Парыжскай АН (з 1933), замежны чл. АН СССР (з 1958). Навук. працы ў галіне квантавай механікі, радыёфізікі, тэорыі атамнага ядра. Адстойвае матэрыялістычны пазіцыі ў трактоўцы з'яў мікрасвету. Выказаў (1924) гіпотэзу пра хвалевыя ўласцівасці матэрыі (гл. *Хвалі дэ Бройля*), якая поўнасцю пацверджана эксперыментальна і лягла ў аснову сучаснай квантавай механікі. Нобелеўская прэмія 1929.

Тв.: Рус. пер.— По тропам науки, М., 1962; Революция в физике, 2 изд., М., 1965.

БРОК (Broch) Олаф (4.8.1867, г. Гортэн — 28.1.1961), нарвежскі мовазнавец-славіст. Праф. ун-та ў Осла (1900). Стваральнік слав. апісальнай фанетыкі. Даследуючы слав. мовы, значную ўвагу аддаваў бел. мове і яе дыялектам («Пра адзін беларускі дыялект на поўдзень ад Вільні», 1957). Аўтар прац: «Нарыс фізіялогіі славянскай мовы» (1910), «Гаворкі на захад ад Масальска» (1916). Пераклаў на нарв. мову «Ганну Карэніну» Л. Талстога і «Братоў Карамазавых» Ф. Дастаеўскага.

Тв.: Studien von der slovakisch-kleinrussischen Sprachgrenze im östlichen Ungarn, [t. 1—2], [б. м.], 1897—99; Die Dialekte des südlichsten Serbiens, Wien, 1903.

Літ.: A. Bibliography of Olaf Broch's published writings, «Scando — Slavica», 1957, t. 3.

БРОКЕРЫ, маклеры, пасрэднікі ў гандлі таварамі і каштоўнымі паперамі. Вядуць аперацыі па даручэнні і за кошт кліентаў. За пасрэдніцтва атрымліваюць камісійны працэнт з сумы заключанай здзелкі. Есць Б. гандл., біржавыя, страхавыя і вэксальныя.

БРОЛЬНІКІ, вёска ў Гарадзечанскім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Валоўка. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 13 *км* на ПнУ ад Навагрудка, 182 *км* ад Гродна, 34 *км* ад чыг. ст. Наваельня. 559 ж., дварoў 158 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, магазін.

Помнік аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БРОМ (Bromum), Br, хімічны элемент VII групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 35, ат. м. 79,904. Адкрыты ў 1826 франц. хімікам А. Ж. Баларам. Знаходзіцца ў саставе соляў у вялікай кары $1{,}6 \cdot 10^{-4}$% па масе. Прыродны Б. мае два стабільныя ізатопы ^{79}Br (50,56%) і ^{81}Br (49,44%). Вядомы штучныя радыеактыўныя ізатопы. Б.— чырвона-бурая вадкасць з непрыемным рэзкім пахам, выдзяляе цяжкую бурую пару, t пл. −7,2 °С, t кіп. 58,8 °С; шчыльн. 3100 *кг/м*^{3}, слаба растваральніках. Належыць да падгрупы *галагенаў*, моцны акісляльнік. Найбольш характэрная Б. рэакцыя — злучэнне з металамі з утварэннем брамідаў (NaBr, $AuBr_3$). З вадародам пры награванні дае бромісты вадарод. З кіслародам непасрэдна не рэагуе, вокіслы Б. атрымліваюць ускосна. Злучэнні з галагенамі няўстойлівыя. Асн. валетнасці I і V. У прамысловасці Б. здабываюць з вады пераважна салёных азёраў і нафтавай, выцясняючы яго хлорам з прыродных брамідаў. Ужываюць у выт. фота- і кінаматэрыялаў, медыкаментаў, фарбавальнікаў, антыдэтанатараў для паліва. Б. ядавіты, пры рабоце з ім неабходна захоўваць меры засцярогі.

БРОН Апісім Міхайлавіч [н. 20.8(1.9).1895, Новамаскоўск Екацярынаслаўскай губ.], рускі савецкі дырыжор. Скончыў Кіеўскую кансерваторыю па класах фп. (1916) і тэорыі кампазіцыі (1918). Быў муз. кіраўніком оперных т-раў у Кіеве, Харкаве, Тбілісі, імя Кірава ў Ленінградзе, імя Неміровіча-Данчанкі ў Маскве і інш., Ансамбля оперы Усесаюзнага радыё і Ансамбля сав. оперы Усерасійскага тэатр. т-ва. У 1944—48 гал. дырыжор Бел. т-ра оперы і балета; паставіў оперы «Кармэн» Ж. Бізэ, «Травіята» і «Рыгалета» Дж. Вердзі, «Алеся» Я. Цікоцкага (1944), «Кастусь Каліноўскі» Дз. Лукаса (1947). У 1957 кіраваў пастаноўкай «Міхася Падгорнага» Цікоцкага.

БРОНЕАЎТАМАБІЛЬ, браніраваны вайсковы аўтамабіль, прызначаны для разведкі, сувязі, дазору. Бываюць лёгкія, сярэднія і цяжкія. Выпускаюцца пераважна лёгкія на коламым ходзе. Узброены кулямётамі, скорасць да 90 *км/гадз*. У грамадз. вайну Б. выкарыстоўваліся для агнявой падтрымкі пяхоты або конніцы. Мелі некалькі кулямётных вежаў. У Вял. Айч. вайну прызначаліся для баявога забеспячэння войск.

БРОНЕТРАНСПАРЦЕР, колавая або гусенічная бранявая машына для перавозкі пяхоты і вядзення бою. Выкарыстоўваецца і для сувязі, разведкі, баявога забеспячэння. Большасць сучасных Б.—*амфібіі*. Звычайна Б. важаць ад 6 да 14 *т*,



умяшчаюць да 15 чал.; маюць таўшчыню брані 12—40 *мм*, скорасць да 70 *км/гадз*, запас ходу 270—450 *км*. На Б. ўстанаўліваюцца кулямёты, малакаліберныя гарматы, процітанкавыя кіроўныя рэактыўныя снарады.

БРОНЗА, сплаў медзі з рознымі хімічнымі элементамі (пераважна з металамі), які шырока ўжываецца ў тэхніцы і мастацтве. Падзяляецца на алавяную і безалавяную Б. У алавянай Б. да 11% волава і дамешкі цынку, свінцу, фосфару, нікелю. Адрозніваецца малым значэннем каэф. трэння па сталі. З алавянай Б. робяць рабочы слой падшыпнікаў слізгання і антыкаразійную арматуру, устойлівую да дзеяння марской вады, арган. кіслот, пары.

Ліццё з алавянай Б. вядомае з глыбокай старажытнасці (гл. *Бронзавы век*). Вырабы паддаюцца чаканцы, залачэнню, серабрэнню; адліўкі цалкам паўтараюць найдрабнейшыя дэталі мадэлі, налёт вокісу (паціна) надае Б. рознын адценні і колер. Раннія маст. вырабы з алавянай Б. в'яўляюцца ў Пярэдняй Азіі, Паўн.-Зах. Індыі (сярэдзіна 3-га тысячагоддзя да н. э.), потым у Егіпце, М. Азіі, на Кіпры і Крыце, з 2-га тысячагоддзя да н. э.— у Еўропе і Кітаі. Пашыраюцца ў Грэцыі (з 6 ст. да н. э.) і Рыме (конная статуя Марка Аўрэлія на пл. Капітолія, 170 н. э., устаноўлена ў 1538 па пастаменце Мікеланджэла). Час росквіту маст. Б.— эпоха Адраджэння (дзверы Фларэнтыйскага баптыстэрыя, 1401—24, Л. Гіберці, і інш.). З канца 17 ст. маст. бронзавае ліццё пашыраецца ў Францыі. У 1684 у Парыжы браты І. Я. і І. Б. Келеры заснавалі фабрыку і калля 1692—93 І. Б. Келер за адзін прыём адліў конную групу з фігурай Людовіка XIV (пастаўлена ў 1699 у Парыжы на Вандомскай пл.). З 18 ст. шырока ўжываецца залочаная Б., ёю ўпрыгожваюць мэблю, фарфор, камень. У эпоху класіцызму Б.— самастойны матэрыял авдобы інтэр'ераў: люстры, бра, гадзіннікі і інш. (майстры П. Гуцьер, П. Ф. Тамір, А. А. і Л. Раўрыо). Сярод твораў маст. Б. ў Расіі — «Цар-гармата» (1586, майстар А. Чохаў), ажурны павільён-шацёр Маск. Успенскага сабора (1627, мастак Дз. Свярчкоў), Самсон (1714, першая бронзавая статуя ў Расіі; фантан у Пецяргофе), «Цар-звон» (1735, майстры І. і М. Маторыны і інш.). У Расіі 18—19 ст. у галіне маст. Б. працавалі П. Ажы, В. Якімаў, С. Зайцаў, А. С. Фішэр, Ф. Шапін і інш. Яны рабілі авдобу парадной мэблі, упрыгожвалі вырабы з каменю і інш. Сав. мастакі, развіваючы традыцыі, выкарыстоўваюць Б. пераважна ў манумент. скульптуры (помнік А. Пушкіну ў Ленінградзе, 1957, скульптар М. Анікушын). У Б. працуюць скульптары З. Азгур, А. Бембель, С. Селіханаў і інш. З Б. вроблены манумент У. І. Леніна ў Мінску (1933, скульптар М. Манізер). Іл. гл. на ўкл.

У алюмініевай Б. 11% алюмінію і дамешкі жалеза, нікелю і марганцу, якія павялічваюць трываласць сплаваў. Устойлівая да сернай і большасці арган. кіслот і ў атмасферы сухіх газаў (хлор, бром). З алюмініевай Б. робяць стужкі, палосы на спружыны, пруткі, трубы і фасонныя адліўкі. Крамяністая Б. мае 1—3% крэмнію, а таксама нікель, цынк, свінец, марганец. Сплавы маюць высокія мех. характарыстыкі пры павышанай т-ры, антыфрыкцыйныя ўласцівасці, добра зварваюцца, паяюцца і апрацоўваюцца рэзаннем. З крамяністай Б. робяць пруткі, стужкі, сеткі, рашоткі, электроды і часам фасонныя адліўкі. Берыліевая Б. мае да 2,4% берылію, ідзе на выраб мембран, спружын, кантактаў, шасцярняў. Марганцовістая Б. вызначаецца павышанай каразійнай стойкасцю, а таксама гарачатрываласцю. Хромістая Б. (хромістая медзь) характарызуецца высокай электра- і цеплаправоднасцю. Ідзе на выраб калектараў эл. рухавікоў, электродаў. У свінцовістай Б. можа быць да 60% свінцу. Тонкім слоем гэтага сплаву ўкрываюць укладышы і ўтулкі, якія працуюць у рэжыме слізгання. Есць таксама Б. сурмяністая, кадміевая, германіевая. Б. ў СССР маркіруецца літарамі Бр. Потым ідуць літары — паказчыкі кампанентаў (О — волава, А — алюміній, Б — берылій, К — крэмній, С — свінец, Мц — марганец, Н — нікель, Ж — жалеза). Колькасць дамешкаў у Б. паказваецца лічбамі пасля літар. Напр., Бр АЖМц 10-3-1,5 паказвае: у бронзе алюмінію 10%, жалеза 3 і марганцу 1,5%. Гл. таксама *Медныя сплавы*.

Літ.: Материалы в машиностроении, т. 1, под ред. И. В. Кудрявцева, М., 1967.
Б. В. Бабушкін (бронза ў тэхніцы). Мінск;
Е. М. Яфімава (бронза мастацкая). Ленінград.

БРОНЗАВЫ ВЕК, перыяд старажытнай гісторыі, калі побач з каменнымі ўжывалі прылады працы, зброю і ўпрыгожанні з бронзы (для большасці краін канец 3 — пач. 1-га тысячагоддзяў да н. э.). На некат. тэрыторыях яму папярэднічаў энеаліт (медна-каменны век), калі ўжываліся рэчы з медзі.

Спачатку бронзу выплаўлялі ў краінах Пярэдняй Азіі, Егіпце, Індыі, Кітаі. У Еўропе Б. в. прыпадае на 2-е — пач. 1-га тысячагоддзя да н. э. Стараж. капальні медзі і волава, неабходныя для вытворчасці бронзы, знойдзены ў Іспаніі, Англіі, Францыі, Аўстрыі, Венгрыі, а на тэр. СССР — у Закаўказзі, Казахстане, Сібіры. Ужыванне бронзавых прылад павышала прадукцыйнасць працы, што вяло да канцэнтрацыі ў руках асобных людзей лішкаў прадуктаў. Пашырыўся абмен паміж рознымі раёнамі. Да таго часу адносяцца першыя скарбы медных і бронзавых рэчаў. Узнікненне маёмаснай няроўнасці прывяло пазней да распаду першабытнаабшчыннага ладу. У некат. краінах Міжземнамор'я, Пярэдняй Азіі, Індыі і Кітая паўляецца рабаўладальніцтва, узнікаюць дзяржавы, пашыраюцца войны як сродак захопу рабоў і маёмасці. У Б. в. адбыўся першы вял. падзел працы — на земляробства і жывёлагадоўлю. Усюды пашыраліся патрылінейна-родавыя адносіны з пануючым становішчам мужчыны ў сям'і і родзе. У Б. в. Цэнтр. Еўропу насялялі плямёны унеціцкай культуры; басейны Одры і Віслы — *лужыцкай культуры*; тэр. Польшчы і правабярэжнай Украіны — *тшынецкай культуры* і *камароўскай культуры*; Украіну і суседнія раёны — ямнай, катакомбнай, трыпольскай, бандарыхінскай, высоцкай, шматвалікавай керамікі культур. На Верхняй Волзе жылі плямёны фацыянальскай — пазней *абашаўскай культуры*; паміж Дняпром і Волгай — *зрубнай культуры* і інш. Шматлікія плямёны разнастайных культур жылі на тэр. Паўн. Каўказа, Сібіры, Сярэд. Азіі, Д. Усходу. Карту гл. на ўкл.

На тэр. Беларусі Б. в. пачаўся на мяжы 3-га і 2-га тысячагоддзяў да н. э. Аддаленасць ад стараж. цэнтраў металургіі была прычынай захавання тут на больш доўгі час каменных прылад працы, аднак апрацаваны яны былі значна лепш: шырока ўжываліся шліфаванне, свідраванне, пілаванне. Рабіліся вял. крамяняўыя наканечнікі коп'яў, кінжалы, сярпы і інш. Крэмень здабывалі ў шахтах (Краснасельскія шахты на тэр. Ваўкавыскага р-на). Бронзавых рэчаў на тэр. Беларусі мала — шылы, сякеры, наканечнікі коп'яў, упрыгожанні. Мясцовая вытв. бронзавых рэчаў з прывазной сыравіны пачалася

ў сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. На пачатку Б. в. тэр. Беларусі засялялі плямёны, якія пакінулі *шнуравой керамікі культуру*. На Бел. Падняпроўе праніклі земляробча-жывёлагадоўчыя плямёны *сярэднедняпроўскай культуры*. У бас. Прыпяці жылі плямёны палескай групы культуры шнуравой керамікі, у Панямонні — прыбалтыйскай культуры. У паасобных раёнах, у т. л. на тарфянікавых паселішчах Паўн. Беларусі, жылі рыбалоўча-паляўнічыя плямёны, якія перанялі ад прышэльцаў земляробства і жывёлагадоўлю. У сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. сярэднедняпроўская культура перарастае ў сосніцкую культуру. Пд Беларусі насялялі плямёны тшынецкай і камароўскай культур, якія, на думку многіх даследчыкаў, былі праславянскія. Насельніцтва Панямоння і Падзвіння ў гэты час ужывала пласкадонны посуд з штрыхоўкай на паверхні. У Б. в. на тэр. Беларусі заўважаюцца ўплывы катакомбнай, зрубнай і мегалітычнай культур; сустракаюцца сляды культуры шматвалікавай керамікі, а на ПдЗ — рэчы лужыцкай культуры.

Літ.: Авдусин Д. А. Археология СССР, М., 1967; Загорульский Э. М. Археология Белоруссии, Мн., 1965; Белорусские древности, Мн., 1967; Древности Белоруссии, Мн., 1966; тое ж, Мн., 1969; Артеменко И. И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы, М., 1967 (Материалы и исследования по археологии СССР, в. 148). *М. М. Чарняўскі*. Мінск.

БРОНЗАГРАФІТ, антыфрыкцыйны матэрыял, атрыманы метадам *парашковай металургіі*. На выраб Б. ідзе шыхта, у якой 86—90% меднага, 8—12 алавянага і калля 2% графітавага парашку. Дэталі з Б. (утулкі, пракладкі, кольцы, упоры) маюць каэф. трэння пры слізганні па сталі без дадатковай змазкі 0,06—0,014, а са змазкай 0,002—0,004; яны немагнітныя і каразійнаўстойлівыя.

БРОНЗАЎКІ (Cetoniinae), падсям. пласцінчатавусых жукоў. Даўж. 7,6—29,6 *мм* (еўран. віды). Колер яркі, з метал. бляскам. Крылы ў час палёту выпростваюцца праз выемкі ў надкрыллях. Вядома больш за 2600 відаў (большасць жыве ў тропіках), у СССР калля 60: Б. залацістая, Б. металічная, Б. венгерская, *алёнка* і інш. Лічынкі Б. жывуць у трухлявай драўніне, глебе, мурашніках, норах грызуноў. Жукі кормяцца бутонамі і кветкамі пладовых дрэў і інш. раслін. Б.— прамежкавыя гаспадары скрэбня-волата, паразіта жывёл і чалавека.



Бронзаўка залацістая.

БРОННАЯ ГАРА, чыг. ст. на лініі Брэст—Баранавічы, пас. у Сакалоўскім с/с Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. За 12 *км* на ПнУ ад Бярозы, 114 *км* ад Брэста. 843 ж., двароў 247 (1970). Мэблевы ўчастак Бярозаўскага а-да металаканструкцый, смола-шкіпарны а-д (засн. ў 1865), лясніцтва. Сярэдняя і муз. школы, 2 клубы, 2 б-кі, дзіцячыя сад і яслі, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны.

У Вял. Айч. вайну каля Б. Г. пям.-фаш. захопнікі забівалі сав. грамадзян. У маі — чэрв. 1942 паводле загаду гітлераўцаў 800 сялян навакольных вёсак выкапалі 8 ям даўжынёй па 45—60 *м*, шырынёй 6—6,5 *м*, глыбінёй 4 *м* і абнеслі іх калючым дротам. З Драгічына, Янава, Гарадца, Брэста, Пінска, Кобрына, Бярозы-Картузскай сюды дастаўлялі эшалоны з сав. грамадзянамі, пераважна з жанчынамі, дзецьмі, старымі. На спец. пляцоўках, агароджаных калючым дротам, асуджаных на смерць прымушалі распранацца, класці вопратку ў пэўнае месца і па драцяных калідорах гналі да ям-магіл, дзе ўкладвалі радамі і расстрэльвалі з аўтаматаў. Да ліст. 1942 ням. фашысты загубілі больш за 50 тыс. чал. Каб замесці сляды сваіх злачынстваў, у сак. 1944 яны прыгналі сюды 100 вязняў, якія 2 тыдні раскопвалі магілы і палілі трупы. Потым акупанты забілі і спалілі тых, хто выконваў гэтыя работы.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944, 2 изд., Мн., 1965.
З. І. Балуга. Мінск.

БРОННІКАЎ Міхаіл Максімавіч [н. 1(14). 10.1914, в. Ланціўшчына Уржумскага пав. Вяцкай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1932. У Чырв. Арміі з 1933. Скончыў ваенна-паліт. вуч. (1937), Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1941). Стралк. дывізіі, начальнікам палітаддзела якой быў Б., вызначыўся ў чэрв.— ліп. 1944 у баях за вызваленне Віцебшчыны. Байцы дывізіі прарвалі абарону праціўніка каля Сіроціна Віцебскай вобл., пад агнём ворага фарсіравалі Зах. Дзвіну каля Бешанковіч, захапілі і ўтрымалі плацдарм. За гэтую аперацыю 48 воінам дывізіі прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Ген.-м. Б. служыць у Сав. Арміі.

БРОНТЭ (Brontë), сёстры Шарлота (21.6.1816—31.3.1855), Эмілі (20.8.1818—19.12.1848) і Ганна (25.3.1820—26.5.1849), англійскія пісьменніцы. З сям'і вясковага свяшчэнніка. Н. ў г. Торнтан. Працавалі настаўніцамі і гувернанткамі. У 1846 выдалі зб. вершаў пад псеўданімам браты Бел. У 1847 выйшлі іх першыя раманы. Шарлота Б.— аўтар сац.-псіхалаг. рэаліст. раманаў з авантурным сюжэтам «Джэн Эйр» (1847), «Шэрлі» (1849), у якіх востра крытыкуе віктарыянскую мараль. Эмілі Б.— аўтар рамант. вершаў, паэм і рамана «Навальнічны перавал» (1847), дзе раскрыта трагедыя чалавечай асобы ў бурж. гр-ве. У творы спалучаюцца элементы рамантызму і рэалізму. Ганна Б. пісала вершы і бытавыя раманы («Агнес Грэй», 1847; «Арандатар Уайлдфел-Хола», 1848).

Тв.: Рус. пер.— Бронте Ш. Джен Эйр, Мн., 1957; Шерли, М., 1963; Бронте Э. Грозовой перевал, Мн., 1958.
Літ.: Шарлотта Бронте. Биобиблиогр. указатель, М., 1956.

БРОНХАЭКТАЗІЯ (лац. bronchus бронх+ +грэч. ectasis расцяжэнне), расшырэнне бронхаў, якое выклікае намнажэнне ў іх макроты і запаленне бранхіяльнай сценкі і тканкі


лёгкіх. Сімптомы ўпершыню апісаны франц. урачом Р. Лаэнекам у 1819. Прыроджаная Б. ўзнікае яшчэ ў плода ад няправільнага развіцця бронхаў. Набытая Б. развіваецца ў дзяцей пры інфекцыйных хваробах (коклюш, адзёр, грып), у дарослых пры пнеўманіях, бранхіяльнай астме, хранічных бранхітах, туберкулёзе, сілікозе, запаленнях прыдаткавых поласцей носа. Хвароба цягнецца гадамі. Сімптомы: кашаль (звычайна раніцай) з гнойнай, а пасля смуроднай з крывёю макротай; патаўшчэнне канцоў пальцаў рук і ног («барабанныя палачкі»), змена формы пазногцяў. Ускладненні: ачаговае запаленне, абсцэс і гангрэна лёгкіх, лёгачна-сардэчная недастатковасць, хваробы нырак. Прафілактыка: загартоўванне арганізма, лячэбная фізкультура, ліквідацыя хвароб, што садзейнічаюць развіццю Б. Лячэнне: агульны гігіенадыетычны рэжым; пераліванне крыві, антыбіётыкі, інгаляцыя, санаторна-курортнае лячэнне.

Літ.: Виноградов В. Н. и Лейзеровская Э. Г. Бронхоэктатическая болезнь, у кн.: Труды XV Всесоюзного съезда терапевтов, М., 1964.

А. І. Гурская. Мінск.

БРОНХІ (грэч. bronchos дыхальная трубка), разгалінаванні трахеі (дыхальнага горла), праз якія паветра паступае ў лёгкія (у паўзуноў, птушак і млекакормячых). У чалавека на ўзроўні 4-га і 5-га грудных пазванкоў трахея дзеліцца на правы і левы галоўныя Б.; апошнія разгаліноўваюцца на ўсё больш дробныя, утвараючы т. зв. бранхіяльнае дрэва — аснову лёгкага. Найдрабнейшыя Б., бранхіёлы, канчаюцца альвеоламі (лёгачнымі пузыркамі). Звонку Б. маюць злучальную абалонку; пад ёю — фіброзны слой з храстковымі кольцамі і паўкольцамі, потым мускульная абалонка, падслізісты слой і слізістая абалонка з мігальным эпітэліем на паверхні. Агульная дзейнасць слізістых залоз, мускульнага слоя і мігальнага эпітэлію ўвільгатняе слізістую абалонку Б., выдаляе часцінкі пылу і мікробы, што трапляюць у Б., а пры захворваннях — макроту. Запаленне Б. — бранхіт. Гл. таксама *Лёгкія.*





Ілюстрацыя да «Выбраных твораў» П. Броўкі (т. 2, Масква, 1969; маст. Г. Кудраўцаў); супервокладка кнігі «Між чырвоных рабін» (Мінск, 1969; маст. П. Драчоў).


БРОЎКА Пятрусь [Пётр Усцінавіч; н. 12(25).6.1905, в. Пуцілкавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі паэт і грамадскі дзеяч. Нар. паэт БССР (1962). Акад. АН БССР (1966, чл.-кар. 1953). Чл. КПСС з 1940. Сын селяніна-беднякa. Скончыў БДУ (1931). Працаваў у ваен. камісарыяце, валвыканкоме, рахункаводам у саўгасе, быў старшынёй сельсавета, на акруговай камсамольскай рабоце, адказным сакратаром газ. «Чырвоная Полаччына». У 1945—48 рэдактар час. «Полымя». Друкавацца пачаў (1926) у газ. «Чырвоная Полаччына» і альманаху «Наддзвінне». Першы зб. «Гады як шторм» (1930), «Прамова фактамі» (1930), «Цэхавыя будні» (1931), аповесць «Каландры» (1931). Раннія лірыка Б. прасякнута матывамі радаснага ўслаўлення рэвалюцыі, новай рэчаіснасці. Перамагаючы некат. рытарычнасць і рамант. схематызм, паэт авалодваў прынцыпамі канкрэтна-рэаліст. адлюстравання жыцця (зб. «Прыход героя», 1935). У гераіка-рамант. паэме «Праз горы і стэп» (1932), прысвечанай падзеям грамадз. вайны, і рэаліст.-бытавой, моцнай сваім выкрывальным пафасам паэме «1914» (1935) Б. дасягнуў непасрэднай канкрэтнасці лірычнага перажывання і праўдзівасці ў раскрыцці чалавечага характару. Тут з найб. відавочнасцю выявілася плённасць яго творчай вучобы ў У. Маякоўскага. У зб. «Вясна Радзімы» (1937) і «Шляхамі баравымі» (1940) побач з праблемамі шырокага грамадскага гучання значнае месца займае інтымная і пейзажная лірыка. Манумент. эпічнасць, што выявілася ў паэме «Кацярына» (1938), узбагачаецца ў вершах унутраным лірызмам. Паэт арганічна засвойвае асаблівасці народнапаэтыч. мыслення. Не адмаўляючыся ад размоўнага, інтанац. верша, часцей звяртаецца да лірыка-песенных формаў. У гады Айч. вайны паглыбляецца эмац. і рэаліст. змест паэзіі Б., узмацняецца яе патрыят. гучанне. Паэт актыўна працуе ў франтавым і партыз. друку. Подзвіг народа, тэма вернасці Радзіме, пераемнасці яе гераічных традыцый атрымалі глыбокае лірычнае і шырокае эпічнае ўвасабленне ў «Паэме пра Смалячкова» (1943), паэмах «Беларусь» (1943) і «Ясны кут» (1944), вершах «Кастусь Каліноўскі», «Надзея-Надзейка», «Рана», «Магіла байца», «Будзем сеяць, беларусы!». Многія творы Б. пасляваен. часу (паэма «Паланянка», 1945; вершы «Парк Перамогі», «Смерць героя») яшчэ звязаны з яго франтавой лірыкай, але пафас творчасці паэта вызначае тэма мірнай працы (паэма «Хлеб», 1946). Працоўны подзвіг народа, дружба сав. людзей, іх барацьба за мір адлюстраваны ў зб. «У роднай хаце» (1946), «Дарога жыцця» (1950; Дзярж. прэмія СССР 1951), «Сонечнымі днямі» (1950), «Цвёрдымі крокамі» (1954), у рамане «Калі звіваюцца рэкі» (1956; літ. прэмія імя Я. Коласа 1957). Паэма «Хлеб», вершы «Думы пра Маскву», «Брат і сястра», «Народнае дзякуй», «Каб мне стаць...», «Спатканне» адзначаны Дзярж. прэміяй СССР (1947). У паэзіі Б., глыбока рэалістычнай, узмацніўся гуманіст. змест, яна стала больш аналітычнай, псіхалагічна пранікнёная, разнастайная па формах і сродках маст. выяўлення (зб. «Пахне чабор», 1959; «Далёка ад дому», 1960; «А дні ідуць...», 1962, Ленінская прэмія 1962; «Высокія хвалі», 1962; «Заўсёды з Леніным», 1967; «Між чырвоных рабін», 1969, Дзярж. прэмія БССР імя Я. Купалы 1969). Адчуванне паўнаты жыцця, яго шматфарбнасці і шматплынnасці, услаўленне стваральнай сілы чалавека, камуніст. ідэалаў сав. людзей — гэтыя матывы з вялікай маст. сілай раскрыты ў лірыка-філас. творах Б. Паэмы «Заўсёды з Леніным» (1956) і «Голас сэрца» (1960) — творы пра вернасць ленінскім запаветам, памяць пра герояў вайны. Б. — паэт высокага грамадз. пафасу, мастак з ярка выяўленай рамант. патэтыкай і песенна-лірычнай накіраванасцю, яго паэзіі ўласціва адкрытая публіцыстычнасць, маштабнасць, яна моцна звязана з жыццём народа, з актуальнымі задачамі камуніст. буд-ва. Аўтар лібрэта опер «Міхась Падгорны» і «Дзяўчына з Палесся». Выступае з артыкуламі па пытаннях л-ры і мастацтва. Перакладаў на бел. мову творы Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, П. Тычыны, М. Бажана, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, А. Пракоф'ева, У. Бранеўскага, Дж. Байрана і інш. Творы Б. перакладзены на многія мовы народаў СССР і за мяжой. Дэп. Вярх. Савета СССР 4—8-га скл. На XX—XXVI з'ездах КПБ выбраны чл. ЦК. У 1948—67 старшыня праўлення СП БССР. З 1967 гал. рэдактар БелСЭ. Сакратар СП СССР. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Збор твораў, т. 1—2, Мн., 1957; Збор твораў, т. 1—4, Мн., 1965—66; Аўтабіяграфія, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 2, Мн., 1966; Лойка А. Сустрэчы з днём сённяшнім, Мн., 1968, с. 33—41; Ярош М. На высокай хвалі, у зб.: На высокай хвалі, Мн., 1968; Светлов М. Беседует поэт, М., 1968, с. 77—80; Исаковский М. Собр. соч., т. 4, М., 1969, с. 90—97; Васілеўскі М. С. і Кавалёнка М. А. [скл.]. Пятрусь Броўка. Бібліягр. даведнік, Мн., 1965.

В. У. Івашын. Мінск.

БРОЎНАЎСКІ РУХ, хаатычны рух дробных часцінак, завіслых у вадкасці ці газе. Адкрыты англ. вучоным Р. Броўнам у 1827, тэарэтычна абгрунтаваны ў 1905—06 М. Смалухоўскім і А. Эйнштэйнам. Б. р. абумоўлены тым, што завіслая часцінка адчувае на сабе ўдары малекул навакольнага асяроддзя, якія ў кожны момант часу не кампенсуюцца. Ад гэтага часцінка прыходзіць у хаатычны рух, скорасць яе мяняецца па велічыні і кірунку (гл. рыс.). Б. р. сведчыць пра цеплавы рух малекул і атамаў: чым вышэйшая т-ра асяроддзя і чым меншая часцінка, тым інтэнсіўнейшы яе рух.



БРУЕВІЧ Мікалай Рыгоравіч [н. 31.10(12.11).1896, Масква], савецкі вучоны ў галіне тэорыі механізмаў і машын і дакладнай механікі. Акад. АН СССР (1942, чл.-кар. 1939), ген.-л. інж.-тэхн. службы. Чл. КПСС з 1921. У 1923 скончыў Маскоўскі ун-т, у 1930 Маскоўскі авіяц. ін-т. У 1929—61 выкладаў у Ваенна-паветранай інж. акадэміі імя Жукоўскага. У Айч. вайну кіраваў распрацоўкай праблем, якія мелі вял. значэнне для авіяцыі. З 1951 у Ін-це машыназнаўства АН СССР. Асн. працы ў галіне даследаванняў лічыльна-рашальных прыстасаванняў і прасторавых механізмаў, прапанаваў тэорыю дакладнасці механізмаў, агульныя метады кінематычнага і кінетастатычнага аналізаў плоскіх і прасторавых механізмаў, стварыў курс лічыльна-рашальных прыстасаванняў. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Точность механизмов, М.—Л., 1946; (разам з Б. Р. Даступавым) Основы теории счетно-решающих устройств, М., 1964.

БРУЖМЕЛЬ (Lonicera), род кустоў сям. бружмелевых. Выш. да 6 *м*. Лісце цэласнае, рэдказубчастае. Кветкі парныя, духмяныя, рознага колеру, у галоўчатых ці коласападобных суквеццях. Плод — сакаўная ягада. Вядома больш за 200 відаў, пашыраных у Паўн. і Паўд. (Анды) паўшар'ях. У СССР 56, на Беларусі 15 відаў, в іх дзіка расце ў мяшаных і хвойных лясах і ў хмызняку толькі Б. лясны (L. xylosteum), нар. назвы: бружэліна, сухадрэўка, свідзіна, бружнеўнік. Астатнія віды (Б. татарскі, Б. пахучы, капрыфоль, Б. жоўты і інш.) выкарыстоўваюць як дэкаратыўныя. Добры медапос.



Бружмель татарскі.



Літ.: Деревья и кустарники СССР, М., 1966.

БРУЙ Фёдар Піліпавіч [н. 19.9(2.10).1907, в. Івана-Агароднікі Слуцкага пав. Мінскай губ.], Герой Савецкага Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1937. З 1928 рабочы на будаўніцтве шашэйных дарог. У Чырв. Арміі з 1929, скон-

чыў курсы «Выстрал». У Айч. вайну ўдзельнічаў у вызваленні Варонежа, Сумаў, Ромнаў. Вызначыўся ў балх на подступах да Кіева 25—28.9.1943. Батальён на чале з Б. вызваліў некалькі нас. пунктаў, фарсіраваў Дзясну, захапіў Труханаў востраў пад Кіевам, на падручных сродках фарсіраваў Дняпро і захапіў плацдарм на правым беразе, адбіў 10 варожых контратак. Цяжка паранены Б. кіраваў боем, пакуль не пераправіліся асн. часці. Жыве ў Вінніцы.


БРУК Абрам Якаўлевіч [3(15).2.1867—1942], беларускі савецкі афтальмолаг. Скончыў Юр'еўскі ун-т (1892). У 1899 у Гомелі на дабрачынныя сродкі адкрыў вочную лячэбніцу, кіраўніком якой быў да 1941 (у 1934 лячэбніца ператворана ў трахаматозна-вочны ін-т). Працы Б. па вывучэнні трахомы спрыялі ліквідацыі хваробы на Беларусі. Удзельнік усесаюзных і рэсп. з'ездаў вочных урачоў.

Тв.: Трахома по материалам Гомельской главной лечебницы за 25 лет, «Гигиена и эпидемиология», 1926, № 6; Об операции придэктомии AB Externo, «Медицинский журнал БССР», 1939, № 7.

БРУКНЕР (Bruckner) Антон (4.9.1824, в. Ансфельдэн каля Лінца — 11.10.1896), аўстрыйскі кампазітар, арганіст і педагог. З 1868 жыў у Вене (праф. кансерваторыі і ун-та). Як сімфаніст спалучыў у сваіх манумент. творах, прасякнутых пантэістычным светаадчуваннем, традыцыі Л. Бетховена і І. С. Баха з моцным уплывам гармоніі і інструментоўкі Р. Вагнера. Акрамя 9 сімфоній (найлепшыя — 4-я, «Рамантычная», 1874; 7-я, 1883), напісаў шмат культавых твораў, у т. л. 3 месы, свецкія кантаты, хоры, струнны квінтэт, п'есы для фп. і аргана.

Літ.: Раппопорт Л. Антон Брукнер, М., 1963.

БРУЛОЎ Карл Паўлавіч [12(23).12.1799, Пецярбург — 11(23).6.1852], рускі жывапісец. Праф. Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (з 1836), ганаровы чл. Міланскай, Балонскай, Фларэнтыйскай, Пармскай акадэмій. Вучыўся ў бацькі — акад. арнаментальнай скульптуры П. Бруло, у Акад. мастацтваў (1809—21) у А. Іванава, А. Ягорава, В. Шабуева. Раннія партрэты (П. і М. Кікіных, Н. Рамазанава, усе 1821—22) выяўляюць сувязь з творчасцю А. Кіпрэнскага. У 1823—34 жыў у Італіі, стварыў шэраг жанравых карцін («Італьянскі ранак», 1823; «Італьянскі поўдзень», 1827), у якіх вырашаў праблемы асвятлення, паказваў узаемасувязь чалавека з прыродай. Рысы рамантызму маюць аўтапартрэт (1823—24), партрэты А. Брулова (1823—24), Р. Гагарына (1827—30), Ю. Самойлавай з выхаванкай (1839—40) і адзін з лепшых — Дж. Пачыні («Жанчына на кані», 1832). Паэт. акварэльныя партрэты С. Тургенева (1823—



27), З. Валконскай (1830). Шырока вядома палатно «Апошні дзень Пампеі» (1830—33, залаты медаль у Парыжы). Трагічная пагібель людзей у час вывяржэння Везувія, патэтыка пачуццяў, веліч чалавечага духу перад сляпой стыхіяй адлюстроўвалі драматычнае ўспрыманне мастаком жыцця. Патрыят. тэма — у карціне «Асада Пскова польскім каралём Стэфанам Баторыем у 1581 г.» (1839—43; няскончаная). З 1843 больш за 4 г. распісваў Ісакіеўскі сабор. Гал. дасягненні гэтага часу — партрэты дзеячаў рус. культуры (Н. Кукальніка, 1836; І. Віталі, 1836—37; В. Жукоўскага, 1837—38; І. Крылова, 1839; А. Стругоўшчыкава, 1840; аўтапартрэт, 1848). У 1849 з прычыны хваробы выехаў на в-аў Мадэйру, у 1850 пераехаў у Рым, там напісаў партрэты археолага М. Ланчы (1851) і членаў сям'і Тытоні (1851—52). Творчасць Б.— адна з вяршынь рус. жывапісу 30—40-х г. 19 ст. У мастацтва класіцызму ён унёс жыццёвасць і непасрэднасць. Рэалізм яго твораў меў пераважна рамантычную афарбоўку. Мастацтву Б. характэрна сцвярджэнне моцных эмоцый, пачуццёва-пластычнай прыгажосці чалавечага цела. У Дзярж. маст. музеі БССР 7 работ Б. (партрэты М. Вільгорскага, 1828; М. Алферакі, 1842, і інш.).

Літ.: Ацаркина Э. Карл Павлович Брюллов. Жизнь и творчество, М., 1963; К. П. Брюллов в письмах, документах и воспоминаниях современников, 2 изд., М., 1961.

БРУМЕЛЬ Валерый Мікалаевіч (н. 14.5.1942, с. Талбузіна Тындзінскага р-на Амурскай вобл.), савецкі спартсмен, засл. майстар спорту СССР (1961). Чл. КПСС з 1964. У 1967 скончыў Цэнтр. ін-т фіз. культуры (Масква). Неаднаразовы рэкардсмен СССР, Еўропы і свету па скачках у вышыню з разбегу. У 1963 устанавіў рэкорд свету 2 *м* 28 *см*. Чэмпіён XVIII Алімп. гульняў (1964, Токіо) і Сусв. студэнцкіх гульняў (1961, Сафія; 1963, Порту-Алегры, Бразілія). Пераможца адкрытага зімовага першынства ЗША (1961, 1963, 1965). Тройчы (1961—63) прызнаны найлепшым спартсменам года ў свеце. У 1962 Б. прысуджаны спарт. міжнар. ўзнагароды: «Прыз Хелмса» і «Залатая Каравела Калумба». Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалём.

БРУН Юльян (парт. псеўд. Спіс, Бранавіч; 21.4.1886, Варшава — 28.4.1942), рэвалюцыйны дзеяч і публіцыст КПП і КПЗБ. Чл. СДКПіЛ з 1905, КПП з 1919. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. Каб пазбегнуць рэпрэсій царскіх улад, эмігрыраваў у Францыю, Балгарыю. З 1919 у Польшчы чл. Цэнтр. рэдакцыі КПРП. У 1924 арыштаваны ўладамі бурж. Польшчы і засуджаны на 8 гадоў турмы. У 1926 у выніку абмену палітзняволенымі паміж СССР і Польшчай выехаў у Сав. Саюз, працаваў у ТАСС. З 1929 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі, прадстаўнік ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. На II з'ездзе КПРП (1923) выбраны чл. ЦК, на V (1930) і VI (1932) з'ездах КПП — канд. у чл. ЦК, на III пленуме ЦК КПЗБ (1929) кааптаваны ў чл. ЦК, а на II з'ездзе КПЗБ (1935) выбраны

чл. ЦК. У 1928—38 адзін з рэдактараў тэарэт. органа ЦК КПП час. «Nowy przegląd» («Новы агляд»). З 1936 да 1941 у эміграцыі ў Бельгіі і Францыі. Напярэдадні Айч. вайны жыў у СССР, займаўся публіцыстыкай.

М. С. Арэхва. Мінск.

БРУНА (Bruno) Джардана (Філіпа; 1548, маст. Нола каля Неапаля — 17.2.1600), італьянскі філосаф-матэрыяліст, барацьбіт супраць схаластыкі і рымска-каталіцкай царквы. Вучыўся ў манастырскай школе дамініканскага ордэна. Абвінавачаны ў ерасі, у 1575 адмовіўся ад сану святчэнніка і ўцёк з манастыра ў Рым. Пазней пакінуў Італію, жыў у Швейцарыі, Францыі, Англіі, Германіі, выступаў супраць тэалогіі, падтрымліваў ідэі М. *Капернікa*. У 1592 вярнуўся ў Італію, дзе быў схоплены інквізіцыяй. 8 гадоў пакутаваў у катавальнях рымскай інквізіцыі, але не адрокся ад свайго вучэння і быў спалены на Плошчы Кветак у Рыме. Б. адстойваў матэрыяліст. ідэі пра бясконцасць Сусвету і незлічонасць светаў, выказаў здагадку пра вярчэнне Сонца і зорак вакол восі. Філас. погляды Б. мелі элементы дыялектыкі: адзінства канечнага і бесканечнага, арганічнага і неарганічнага, фізічнага і псіхічнага, сувязь і рух усіх частак прыроды і г. д. Аднак матэрыяліст. і дыялект. ідэі Б. не былі паслядоўныя. Дапускаў існаванне духоўнай субстанцыі, якая знаходзіцца ва ўсіх рэчах і складае іх рухальную аснову. Усё жыццё Б. вёў барацьбу з папоўшчынай і сярэдневяковым цемрашальствам. У памфлетах «Выгнанне пераможнага звера» (1584), «Тайна Пегаса, з дадаткам Кіленскага асла» (1585) Б. крытыкаваў усе віды рэлігіі і іх догматы, якія існавалі ў той час; прапанаваў новую мараль, заснаваную на імкненні чалавека да ісціны і працы. У мастацкім творы «Падсвечнік» (1582) паказаў псеўданавуковасць тэорый тагачасных містыкаў (астролагаў, алхімікаў і інш.). Творы Б. вядомыя на Беларусі з 17 ст. З імі знаёміліся Я. Белабоцкі і члены Астранамічнай школы ў Вільні. А. Доўгірд лічыў Б. першым барацьбітом супраць схаластычнага светапогляду.



Тв.: Рус. пер.— Диалоги, М., 1949; О героическом энтузиазме, М., 1953.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Рожицын В. С. Джордано Бруно и инквизиция, М., 1955; Корниенко В. С. Философия Джордано Бруно, М., 1957.

Э. К. Дарашэвіч. Мінск.

БРУНЕЙ (Brunei), султанат над пратэктаратам Вялікабрытаніі на поўначы в-ва Калімантан. Пл. 5765 *км*². Нас. 107 тыс. чал. (1967); малайцы, даякі і інш. Сталіца г. Бруней. Клімат трапічны. 75% тэр. пад трапічнымі лясамі. Аснова эканомікі — здабыча нафты (3,9 млн. *т*, 1965). Земляробства, жывёлагадоўля, лясны промысел, лоўля рыбы. Гал. с.-г. прадукты: каўчук, рыс, какосавыя арэхі, садавіна. Гадуюць буйвалаў, коз, свіней; птушкагадоўля. Пільні. Вываз: нафта (больш за 90% экспарту), каўчук, кашт. драўніна. Грашовая адзінка — долар Б.

БРУНЕЛЕСКІ, Брунелеска (Brunelleschi) Філіпа (1377, Фларэнцыя — 15.4.1446), італьянскі архітэктар. Заснавальнік архітэктуры Адраджэння, стваральнік тэорыі перспектывы. Працаваў пераважна ў Фларэнцыі. Збудаваў грандыёзны купал (дыяметр 42,5 *м*; з 1426 па мадэлі 1420) сабора Санта-Марыя дэль Ф'ёрэ, які стаў арх. дамінантай Фларэнцыі. У элегантнай арачнай лоджыі Выхавацельнага дома (з 1421), у перакрытых лёгкімі рабрыстымі купаламі і расчляненых ордэрам цэнтрычных інтэр'ерах Старой сакрыстыі ц. Сан-Ларэнца (1422—28) і капэлы Пацы (з 1429) Б. ўпершыню ўвасобіў у арх. вобразах мастацкія ўяўленні эпохі гуманізму. Па-новаму вырашыў кампазіцыю цэркваў Сан-Ларэнца (1422—46) і Санта-Спірыта (з 1444), дзе манументальнасць і стройнасць інтэр'еру дасягаецца своеасаблівым спалучэннем арак, калон і адрэзкаў ордэрнага антаблемента над капітэлямі. Акрамя палаца ды Партэ Гвельфа Б. прыпісваюць палацца Піты (з 1440), усе тры паверхі якога аднолькавай вышыні і складзены з груба абчасаных вял. каменных блокаў. Б. першы парваў путы сярэдневяковай цэхавай абмежаванасці. Спалучыўшы рысы архітэктара, будаўніка і вучонага, праклаў шляхі новага, паэт. вольнага выкарыстання антычных арх. формаў для вырашэння функцыянальных, ідэйных і канструктыўна-будаўнічых задач свайго часу.



Літ.: Филиппо Брунеллеско, М., 1935; Геймюллер Г. Филиппо ди Сер Брунеллеско, пер. с нем., М., 1936.

БРУНОЎ Мікалай Іванавіч [н. 13(25).11.1898, Масква], савецкі гісторык архітэктуры. Чл.-кар. Акадэміі архітэктуры СССР (1941—56), праваднасл. чл. Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР (1957—61), д-р мастацтвазнаўства (1943), прафесар (з 1934) Маскоўскага архітэктурнага інстытута. Вядомы працамі па гісторыі архітэктуры еўрап. краін, асабліва Візантыі і Расіі. Асн. ў працах — вызначэнне ролі рус. дойлідства ў гісторыі сусв. культуры. Адзін з першых даследчыкаў бел. архітэктуры. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

Тв.: Белорусская архитектура XI—XII ст., у кн.: Зборнік артыкулаў, Мн., 1928; Очерки по истории архитектуры, т. 1—2, М.—Л., 1935—37; Эрехтейон, М., 1938; Дворцы Франции XVII—XVIII вв., [М.], 1938; Архитектура эпохи Древнерусского государства и периода феодальной раздробленности Руси (до середины XV в.), у кн.: История русской архитектуры, 2 изд., М., 1956.

БРУСАЎ Аляксандр Якаўлевіч [17(29).10.1885, Масква — 1.12.1966], савецкі археолаг. Засл. дз. нав. РСФСР. Чл. КПСС з 1954. Працаваў у Гістар. музеі (Масква), Ін-це гісторыі матэрыяльнай культуры, Ін-це археалогіі АН СССР. Вывучаў эпоху неаліту і бронзы на Пн і ПнЗ СССР, у т. л. на Беларусі, паходжанне індаеўрапейцаў і гісторыю плямённаў шнуравой керамікі культуры. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

Тв.: Свайное поселение на р. Модлоне и другие стоянки в Чарозерском районе Вологодской области, у кн.: Поселения эпохи неолита и раннего металла на севере Европейской части СССР, М.—Л., 1951 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 20); Очерки по истории племен Европейской части СССР в неолитическую эпоху, М., 1952.

БРУСАЎ Валерый Якаўлевіч [1(13).12.1873, Масква — 9.10.1924], рускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1920. Праф. Маск. ун-та (1921). З сям'і купца. Вучыўся



на гістор.-філал. ф-це Маск. ун-та (1893—99). У 1-ю сусв. вайну франтавы карэспандэнт. Удзельнічаў у выданнях М. Горкага. З 1917 працаваў у сав. дзярж. установах. Пачаў друкавацца ў 1894. У ранняй творчасці моцны ўплыў еўрап. і рус. дэкадансу. Пачынальнік сімвалізму ў рус. л-ры [З зб. «Рускія сімвалісты», 1894—95; «Chefs d'Oeuvre» («Шэдэўры»), 1895; «Me eum esse» («Гэта — я»), 1897]. У зб. «Urbi et Orbi» («Гораду і свету», 1903) — паварот да паэт. распрацоўкі грамадскай тэматыкі. Цыкл «Сучаснасць» у зб. «Stephanos» («Вянок», 1906) услаўляў рэвалюц. подзвіг народа, але Б. успрыняў рэв. 1905 як сілу толькі разбуральную. Анархізм паэта адзначаў У. І. Ленін. У перыяд рэакцыі Б. выкрываў заганы капіталіст. горада, апяваў працу чалавека (зб. «Усе напевы», 1909), стварыў узоры пейзажнай і інтымнай лірыкі. Напісаў гістар. раманы «Вогненны анёл» (1908) і «Алтар перамогі» (1913). Вітаў Кастр. рэв. і яе правадыра У. І. Леніна («Трэцяя восень», «Да рускай рэвалюцыі», «Ленін», «Пасля смерці У. І. Леніна»). Паэзія Б. сав. перыяду ў зб. «Апошнія мары» (1920), «У такія дні» (1921), «Міг» і «Далі» (1922), «Meal» («Спяшайся!», 1924). Выступаў як драматург, літ. крытык і тэарэтык верша. За пераклады арм. паэтаў у 1923 атрымаў званне нар. паэта Арменіі. Пераклаў вершы бел. паэтаў, у т. л. «На Купалле», «Адцвітанне», «Як у лесе зацвіталі...», «У лясным царстве» Я. Купалы. У 1921 арганізаваў у Маскве Вышэйшы літ.-маст. ін-т.

Тв.: Стихотворения, Мн., 1955; Стихотворения и поэмы, 2 изд., Л., 1961; бел. пер.— у кн.: Анталогія рускай савецкай паэзіі, Мн., 1936; Руская савецкая паэзія, Мн., 1953.

Літ.: Луначарский А. В. Собр. соч., т. 1, М., 1963, с. 430—463; Сергиевский Н., В. Я. Брюсов, М., 1944; Поступальский И. С., В. Брюсов и М. Богданович, у кн.: Брюсовские чтения 1966 года, Ереван, 1968; Максимов Д., Брюсов. Поэзия и позиция, Л., 1969.

Ф. І. Куляшоў. Мінск.

БРУСЕЛЬ (франц. Bruxelles, флам. Brussel), сталіца Бельгіі, адм. ц. правінцыі Брабант. У цэнтры краіны. Горад перасякаецца каналам, які злучае Б. з марскім портам Антверпенам і прамысл. цэнтрам Шарлеруа. Вял. вузел чыг. і шашэйных дарог. Міжнар. аэрапорт. У Б. 1079 тыс. ж. (1967).

Упершыню ўпамінаецца ў 7 ст. У 11 ст. цэнтр графства Брабант. З 16 ст. ўваходзіў у складІсп. Нідэрландаў. Цэнтр *Бельгійскай рэвалюцыі 1830*. З 1830 сталіца Бельгіі. У 1914—18 і 1940—44 акупаваны герм. войскамі. У Б. жылі і працавалі (1845—48) К. Маркс і Ф. Энгельс. Тут напісаны «Маніфест Камуністычнай партыі». 17(30).7—24.7(6.8).1903 працаваў II з'езд РСДРП, у рабоце якога ўдзельнічаў У. І. Ленін.

Развіта пераважна дакладнае і эл.-тэхн. машынабудаванне, вагона- і прыладабудаванне. Аўтазборачныя з-ды замежных фірмаў. Хім., харч., паліграф. прамысловасць. Здаўна існуе саматужная вытв. карункаў, тонкага палатна, дываноў, ювелірных вырабаў, мэблі.

Б. быў абкружаны 4 кольцамі сцен (на месцы апошняга кольца — бульвары). Збераглісяся «Чорная вежа» (каля 1200), вароты Порт-дэ-Аль (каля 1379—81). Планіроўка цэнтра горада спрадвечная — радыяльна-кальцавая. Верхні горад з палацам, паркам, парадным ансамблямі, Ніжні горад — дзелавая і гандл. частка Б. Рабочыя і прамысл. кварталы на ўскраінах. Помнікі архітэктуры: сабор Сен-Мішэль-э-Гюдзюль (каля 1000—16 ст.); ансамбль Вялікай пл. (з 12 ст.) з ратушай (1401—54), гільдзейскімі дамамі і інш.; ц. Трынітэ (1621, Ж. Франкарт); ансамбль Каралеўскай пл. (1774—80). Сярод помнікаў 19 ст.: Пляц юстыцыі (1866—83, Ж. Пуларт), Калона Кангрэсу (1850—59), асабняк Тасель (1892) і Народны дом (1896, абодва В. Арта); асабнякі ў Іксле (1895, Х. ван дэ Велдэ), Стакле (1905—11). Пасля 1-й сусв. вайны пабудаваны рабочы пасёлак Сіта-Мадэрн (1922—27, В. Буржуа). Сучасная архітэктура: комплекс Сусв. выстаўкі (1958, павільён «Жэні сівіль»); будынак Сац. забеспячэння (1959, Х. ван Кейк); вышынныя адм. будынкі Тур Маду, Тур дэю Мідзі; жылы комплекс Сіта-Мадэль у Хейселі (усе ў 1966).

У Б. Акадэмія навук, л-ры і прыгожых мастацтваў; ун-т (з 1834) з НДІ. Асн. музеі: Каралеўскі музей прыгожых мастацтваў (з 1830), Каралеўскія музеі мастацтва і гісторыі, музеі Менье, Шарлье, Спекарт, Каралеўскі музей Конга.

БРУСЕЛЬСКІ ПАКТ, дагавор, падпісаны ў Бруселі 17.3.1948 Вялікабрытаніяй, Францыяй, Бельгіяй, Нідэрландамі і Люксембургам, якім быў афармлены агрэсіўны ваенна-палітычны саюз гэтых дзяржаў.

Б. п. першы крок на шляху стварэння агрэсіўных блокаў вах. дзяржаў пасля 2-й сусв. вайны. Стратэгічнае значэнне пасля стварэння Паўночнаатлантычнага саюза (НАТО), куды ўвайшлі ўсе краіны — удзельніцы Б. п. У 1954 адрадзіўся пад назвай *Заходнееўрапейскага саюза*, у які, акрамя пералічаных дзяржаў, увайшлі ФРГ і Італія. СССР і інш. сацыяліст. краіны выкрываюць агрэсіўны характар Б. п.

БРУСЕЛЬСКІЯ КАНВЕНЦЫІ, дагаворы, якія рэгулююць пытанні міжнароднага марскога права. Прынятыя Брусельскімі канферэнцыямі ў 1905—57. СССР у 1926 прызнаў дзве Б. к.: пра дапамогу і ратаванне на моры і пра пакрыццё страт пры сутычцы марскіх суднаў. Пазней прадстаўнікі СССР удзельнічалі ў рабоце Брусельскіх канферэнцый і падпісалі інш. канвенцыі і пагадненні па пытаннях міжнар. марскога права, заключылі шэраг двухбаковых пагадненняў з інш. краінамі па пытаннях гандлёвага мараплаўства.

Кр.: Сборник международных конвенций, договоров, соглашений и правил по вопросам торгового мореплавания, М., 1959. *Г. Г. Цернавая.* Мінск.

БРУСІЛАЎ Аляксей Аляксеевіч [19(31).8.1853, Тыфліс — 17.3.1926], рускі ваенны дзеяч. На вайск. службе з 1872. Удзельнік рус.-тур. вайны 1877—78. У 1912—13 пам. камандуючага войск Варшаўскай ваен. акругі. У 1-ю сусв. вайну камандаваў 8-й арміяй, з сак. 1916 галоўнакамандуючы Паўд.-Зах. фронту. Пад кіраўніцтвам Б. ажыццёўлены прарыў аўстра-германскага фронту (Луцкі, або Брусілаўскі прарыў), разбіта аўстра-венгерская армія. Гэта зрабіла вялікі ўплыў на вынік ваен. дзеянняў на руска-герм. фронце ў 1916 і паставіла Б. ў шэраг вядомых военачальнікаў 1-й сусв. вайны. У маі — чэрв. 1917 вярхоўны галоўнакамандуючы рус. арміі (у Магілёве). Пад націскам А. Ф. Керанскага падпісаў загад пра ўвядзенне пакарання смерцю на фронце. Пасля няўдалага чэрвеньскага наступлення (1917) Б. заменены Л. Г. Карнілавым і назначаны саветнікам пры Часовым уradзе. З 1920 у Чырв. Арміі, працаваў у Наркамаце па ваен. справах, у 1923—24 інспектар па кавалерыі РСЧА.


Тв.: Мои воспоминания, М., 1963.

Літ.: Ветошников Л. В. Брусиловский прорыв, [М.], 1940; Наступление Юго-Западного фронта в мае — июне 1916 г. [Зб. дакументаў], М., 1940.

БРУСІТ (ад прозвішча Bruce), мінерал, прыродны гідрат магнію $Mg(OH)_2$. Змяшчае 69% магнію, часам прымесь да 14% MnO (манганабрусіт) і FeO (ферабрусіт). Крышталі шырокатаблітчастыя трыганальнай сістэмы, звычайна суцэльныя ліставатыя масы. З выгляду нагадвае гіпс. Колер белы, сіняваты або зеленаваты, бляск перламутравы. Цв. 2,5; шчыльн. 2380—2400 *кг/м*^{3}. Растварaецца без астатку ў кіслотах. Паходжанне экзагеннае (другасны мінерал па магнезіяльных сілікатах) і нізкатэмпературнае гідратэрмальнае. Трапляецца разам з серпенцінам, хларытам, магнезітам і інш. мінераламі. Магнезевая руда. Радовішчы ў СССР (Урал, Якуція), ЗША (Тэхас) і інш.

БРУСНІЦЫ (Vaccinium vitis idaea), кусцікавая расліна сям. бруснічных. Сцябло галінастае, выш. 10—25 *см*, карэнішча паўзучае. Лісце эліптычнае, скурыстае. Кветкі бела-ружовыя, у гронках. Плод — шарападобная чырвоная ягада. Расце ў тундрах, хвойных лясах, на тарфяных балотах Паўн. паўшар'я. Добры меданос. Ягады ядомыя, кісла-салодкія, маюць цукар і бензойную к-ту, якая засцерагае іх ад загнівання. На Беларусі Б. мочаць, з іх вараць варэнне, павідла, робяць віно, сокі. Лісце Б. мае глікавід арбуцын, дубільныя рэчывы, вітамін С. Адвар з лісця ўжываецца ў медыцыне.

БРУСТЭРА ЗАКОН, закон, які вызначае суадносіны паміж паказчыкам пераламлення n дыэлектрыка і такім вуглом падзення φ светлавога праменя, пры якім адбітае ад паверхні дыэлектрыка натуральнае святло поўнасцю палярызуецца (гл. *Палярызацыя святла*).



Адкрыты ў 1815 англ. фізікам Д. Брустэрам (1781—1868). Паводле Б. з. $\operatorname{tg}\varphi = n$, дзе φ — вугал Брустэра. Пры выкананні Б. з. вугал паміж адбітым і пераломленым прамянямі складае 90° (гл. рыс.). Б. з. ужываль ны для любога электрамагнітнага выпрамянення, калі даўжыня хвалі яго малая ў параўнанні з адлегласцю ад крыніцы хвалі да мяжы падзелу двух асяроддзяў, а таксама з працягласцю гэтай мяжы.

Літ.: Ландсберг Г. С. Оптика, 4 изд., М., 1957 (Общий курс физики, т. 3); Борн М. Оптика, пер. с нем., Харьков — Киев, 1937.

БРУСЫ, вёска ў Брусаўскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл., каля р. Вузлянка (1 *км*). За 12 *км* на Пд ад Мядзела, 132 *км* ад Мінска, 31 *км* ад чыг. ст. Княгініна; на шашы Маладзечна — Вілейка. 389 ж., двароў 140 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, медпункт, 2 магазіны. У Вял. Айч. вайну вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 60 чал., якіх фашысты спалілі жывымі ў 1943.

БРУСЯТА, рака, левы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 37 *км*. Пачынаецца з воз. Нерыб на Пн Цэнтральнабярэзінскай раўніны, цячэ ў Крупскім і Бярэзінскім р-нах Мінскай вобл. Вадазбор (363 *км*^{2}) — водналедавіковая раўніна. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2,3 *м*^{3}/*сек*.

БРУТА (італьян. brutto літар. грубы), агульны, валавы. Тэрмін пашыраны ў гандлёвай, фінансава-банкаўскай і страхавой практыцы. Напр., брута-маса — маса тавару разам з упакоўкай, брута-даход — валавы даход без выліку расходаў, брута-стаўка — стаўка страхавых плацяжоў з надбаўкай на пакрыццё расходаў па арг-цыі страхавання. Параўн. *Нета*.

БРУХАВА, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., каля Вял. Арэхаўскага воз. (2 *км*). Падпарадкоўваецца Арэхаўскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр калгаса «Шлях Саветаў». За 32 *км* на Пн ад Оршы, 70 *км* ад Віцебска, 11 *км* ад чыг. ст. Хлюсціна. 360 ж., двароў 106 (1970). Клуб, б-ка, аддз. сувязі.

БРУХАНАЎ Аляксей Іванавіч (15.3.1923, в. Ваніна Гарахавецкага пав. Уладзімірскай губ.— 17.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. Пад агнём ворага пераправіўся з групай разведчыкаў цераз раку, захапіў фаш. дзот, гэтым садзейнічаў пераправе воінаў батальёна. Загінуў у баі.

БРУЦЭЛЕЗ (мальтыйская ліхаманка, хвароба Банга і інш.), хранічная інфекцыйная хвароба чалавека і жывёл.

Узбуджальніка Б. (дробныя шара- або палачкападобныя бактэрыі — бруцэлы) выявіў у 1886—87 англ. бактэрыёлаг Д. Брус. Чалавек можа заразіцца ад хворай жывёлы, ад інфікаваных прадуктаў (сырых малочных, мясных і інш.). Хвароба суправаджаецца гарачкай, моцнымі дрыжыкамі, высыпкай на скуры, болем галавы, паносам, бяссонніцай, слабасцю. Пашкоджваюцца касцёва-сустаўная, перыферычная, радзей цэнтр. нервовая

сістэмы. Адбываюцца змены ў печані, селязёнцы і інш. унутр. органах. Лячэнне: антыбіётыкі, процібруцэлёзная вакцына. Прафілактыка: жыхарам мясцовасці, дзе пашраны Б., робяць прышчэпкі. Малако ад хворых кароў пастэрызуюць, брынзу ўжываюць пасля 2, цвёрдыя сыры пасля 3 месяцаў, мяса — праваранае або прасоленае (не менш 2 месяцаў). На Б. могуць хварэць свойскія і дзікія жывёлы. Хвароба хранічная, звычайна ў скрытай форме. Пры вострай інфекцыі бываюць масавыя аборты (у кароў на 5—8-м месяцы, у авечак і коз на 3—5-м, у свіней на 2—3-м). Меры барацьбы: ахова здаровага статку ад інфекцыі, своечасовае выяўленне хворай жывёлы; ізаляцыя яе; дэзінфекцыя памяшканняў і двароў; імунізацыя жывёл вакцынай.

Літ.: Бруцеллез, под ред. П. А. Вершиловой, М., 1961; Юсковец М. К. Бруцеллез сельскохозяйственных животных, 2 изд., М., 1960.

М. К. Юскавец.

БРУЧКА (Brassica napus), двухгадовая караняплодная расліна сям. крыжакветных. У першы год дае ўраджай караняплодаў і бацвіння (лісця), на другі з высаджаных караняплодаў развіваюцца кветкавыя сцяблы і насенне. Лісце цэласнае або слабарассечанае. Кветкі залаціста-жоўтыя, суквецце — гронка, плод — стручок. Насенне дробнае, чорнае або чорна-бурае. Караняплод круглаваты або авальны, мякаць сакаўная, белая ці жоўтая. Вільгацялюбная расліна, добра развіваецца на сугліністых глебах, асушаных тарфяніках і пераносіць замаразкі. Вегет. перыяд 120—170 дзён. Вырошчваецца пераважна ў нечарназёмнай палосе на корм жывёле. Вітаміну С мае болей за інш. караняплоды. Вядомы сталовыя і кармавыя сарты. Найлепшыя для БССР: Шведская, Бангольмская, Краснасельская. Сярэдняя маса 350—1800 *г*, ураджайнасць караняплодаў 200—500, бацвіння — 70—300 *ц/га*. З 1963 у БССР вырошчваецца новая кармавая гібрыдная бручка — куузіка (маса караняплода 2—10 *кг*), ураджайнасць 350—700 *ц/га*.



Літ.: Ипатьев А. Н. Овощные растения земного шара, Мн., 1966; Борисевич И. М. Гибридная брюква куузинка, Мн., 1966; Шебалина М. А. Репа и брюква, Л., 1967.

БРУШНЫ ТЫФ, вострая інфекцыйная хвароба з групы кішачных. Пашыранасць яго залежыць ад сац. умоў. Войны, голад, неўладкаванасць быту, водазабеспячэння, грамадскага харчавання спрыяюць эпідэміям. Узбуджальнік (палачка брушнога тыфу) трапляе ў арганізм з ежай і вадой. Пасля інкубацыйнага перыяду (10—14 дзён) паяўляюцца слабасць, дрыжыкі, страта апетыту, боль галавы, бяссонніца, высокая т-ра, трызненне (тыфозны стан), затрымліваецца надворак. На 9—12-ы дзень на скуры паяўляецца высыпка — дробныя руковыя кропкі. Ускладненні: кішачны крывацёк, прарыў сценкі кішэчніка, перытаніт. Пасля хваробы ствараецца стойкі імунітэт. Лячэнне: пасцельны рэжым, высокакаларыйная ежа; лякарствы: леваміцэцін і сінтаміцын. Прафілактыка: добраўпарадкаванне гарадоў і інш. нас. пунктаў, сан. нагляд за прадпрыемствамі і ўстановамі грамадскага харчавання і водазабеспячэння, абеззараджванне нечыстот, барацьба з мухамі, выяўленне бацыланосьбітаў (гл. *Бацыланосьбітва*), сан.-асвет. работа, прышчэпкі.

Літ.: Вилибин А. Ф. Брюшной тиф, паратиф А и паратиф В, у кн.: Руководство по инфекционным болезням, М., 1962; Мельник Е. Г. Брюшной тиф, у кн.: Руководство по микробиологической диагностике инфекционных болезней, М., 1964.

Н. В. Бондарава. Мінск.

БРУШЫНА, серозная абалонка, якая высцілае сценкі брушной і тазавай поласцей і ўкрывае размешчаныя ў іх кішэчнік, страўнік, печань, матку і інш. ўнутраныя органы. Тонкая, празрыстая пласцінка. Складаецца з валакністай злучальнай тканкі, высланай плоскімі клеткамі мезатэлію. Паверхня Б. гладкая, увільгочваецца серознай вадкасцю, што палягчае слізгаценне кішэчніка ў час перыстальтыкі і рух інш. органаў брушной поласці. Б. мае ахоўную функцыю (паглынае і знішчае бактэрыі). Утварае *брыжэйку* і сальнік. Запаленне Б.— *перытаніт*.

БРЫГАДА (франц. brigade), 1) вайсковае злучэнне часцей аднаго і больш родаў войск. Складаецца пераважна з некалькіх палкоў, батальёнаў, дывізіёнаў і інш. часцей і падраздзяленняў. Бываюць мотастралковыя, аўтамабільныя, артылерыйскія, танкавыя, інжынерныя і інш. Б. 2) У ВМС — тактычнае злучэнне караблёў аднаго класа. 3) Брыгада партызанская — самастойнае партыз. фарміраванне, якое аб'ядноўвае некалькі партыз. атрадаў. 4) У прамысловасці — *брыгада вытворчая*. 5) У с. гасп.— *брыгада сельскагаспадарчая*.

БРЫГАДА ВЫТВОРЧАЯ, вытворчы калектыў, які аб'ядноўвае рабочых адной ці розных прафесій для сумеснай працы па выкананні адзінага вытв. задання ў прамысловасці, буд-ве, на транспарце. Найбольш пашраны спецыялізаваныя і комплексныя брыгады. У спецыялізаваных рабочыя адной прафесіі выконваюць аднародныя тэхналаг. аперацыі. У комплексных адначасова выконваюцца тэхналагічна разнастайныя работы, якія ахопліваюць увесь працэс вытворчасці пэўнага віду прадукцыі. Ім уласціва шырокая ўзаемазамяняльнасць рабочых на аснове сумяшчэння прафесій. Заработак паміж членамі брыгады размяркоўваецца ў адпаведнасці з адпрацаваным часам і тарыфнай стаўкай рабочага. На чале Б. стаіць брыгадзір, які арганізоўвае работу брыгады, улічвае працу, адказвае за выкананне планавых заданняў і рацыянальнае выкарыстанне сродкаў вытворчасці.

В. В. Пашкевіч. Мінск.

БРЫГАДА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ (пастаянная вытворчая брыгада), асноўная форма арганізацыі працы і вытворчасці, найважнейшая гаспадарчая адзінка ў калгасах і саўгасах. Уключае пастаянны калектыў работнікаў, які выконвае пэўныя віды работ. Бываюць галіновыя, спецыялізаваныя і комплексныя брыгады. У галіновых вырабляюць некалькі відаў прадукцыі адной галіны с. гасп. (паляводства, жывёлагадоўля, агародніцтва, садоўніцтва і інш.). Спецыялізаваныя забяспечваюць вытв. аднаго віду прадукцыі (малака, лёну, тытуню і г. д.) або выкананне асобных работ (нарыхтоўчыя брыгады, трактарныя, будаўнічыя і інш.). Комплексныя абслугоўваюць некалькі галін с. гасп. За брыгадамі замацоўваюць с.-г. ўгоддзі, тэхніку, рабочую і прадукцыйную жывёлу, вытв. будынкі і інвентар. Кожнай брыгадзе даецца гасп.-разліковае заданне на год па аб'ёме работ, валавой прадукцыі, ураджайнасці с.-г. культур, прадукцыйнасці жывёлы, ліміты выдаткаў. Колькасць брыгад залежыць ад памеру зямельных угоддзяў, структуры гаспадаркі, размяшчэння населеных пунктаў.

У. Ф. Тарасевіч. Мінск.

БРЫГАНЦІНА (франц. brigantine), двухмачтавае парусное судна з прамымі парусамі на фок-мачце (насавой) і косымі на гротмачце (кармавой). У мінулым ужываліся ў ваен. флоце, а з сярэдзіны 19 ст.— толькі ў камерцыйным. З-за добрых мараходных і лавіровачных якасцей будуюць сучасныя Б., даўж. якіх 22—28 *м*, водазмяшчэнне 180—260 *т*.



Пярэступ белы.

БРЫЁНІЯ, пярэступ (Bryonia), род шматгадовых травяністых раслін сям. гарбузовых. Сцябло павойнае, кветкі дробныя, жаўтавата-белыя або зялёныя, плод — ягада, корань мясісты, рэпападобны. Цвіце Б. ў чэрв.—ліп. Вядома больш за 10 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы. У БССР — пярэступ белы (B. alba). Карані маюць ядавітыя гліказіды і выкарыстоўваюцца ў медыцыне (настой) для абязбольвання і як кроваспыняльны сродак. Дэкар. расліна.

БРЫЖЫНКІ, вёска ў Узмёнскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл., на р. Зах. Дзвіна. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 30 *км* на ПнУ ад Міёраў, 170 *км* ад Віцебска, 13 *км* ад чыг. ст. Верхнядзвінск. 130 ж., двароў 38 (1970). Клуб. Помнік сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.


БРЫЖЭЙКА (польск. bryże брыжы), складка *брушыны*, якою прымацоўваюцца ўнутрыбрушныя органы (тонкі кішэчнік, чэрвепадобны адростак, папярочная абадочная і сігмападобная кішкі, матачныя трубы і яечнікі) да задняй сценкі брушной поласці. Складаецца з 2 лісткоў брушыны, між якіх размешчаны артэрыі, вены, лімфатычныя сасуды і вузлы, а таксама нервы, што ідуць да ўнутр. органаў, і тлушчавая клятчатка.

БРЫЗГЛІНА (Euonymus), род лістападных ці вечназялёных кустоў або невялікіх дрэў сям. брызглінавых. Выш. 1—9 *м*. Галінкі гладкія або ў густых бародаўках. Лісце цэласнае. Кветкі плоскатыя, зеленавата-белыя ці пурпуровыя, часам плямістыя, у паўпарасоніках. Вядома 220 відаў, пашыраных у лясах Еўропы, Азіі, Амерыкі, Аўстраліі. У СССР 18 відаў, на Беларусі 4, в іх Б. еўрапейская (E. europaea), пар. назвы: браздзельнік, бразгуліна, бруслён, гіржамяліна, сухалеснік і Б. бародаўчатая (E. verrucosa), пар. назвы: бруздзявіна, страмяніна, трамяліна, бружнеўнік, растуць дзіка ў шыракалістых і мяшаных лясах. Б. шыракалістая (E. latifolia) і Б. карлікавая (E. nana) вырошчваюцца як дэкаратыўныя. У каранях Б. да 23% гуты, у насенні да 45% каштоўнага невысыхальнага алею. Драўніна выкарыстоўваецца на клавішы, шавецкія цвікі.

Літ.: Харитонович Ф. Н. Бересклет европейский и агротехника его выращивания, М.— Л., 1956.

БРЫЗЕНТ (галанд. presenning), шчыльная льняная, паўільняная ці баваўняная тканіна, прапітаная воданепранікальнымі і процігніласнымі саставамі. Гл. таксама *Тэхнічная тканіна*.

БРЫКЕТАВАННЕ, працэс ператварэння дробных і сыпкіх матэрыялаў у трывалыя кускі (брыкет). Робіцца пераважна, каб зменшыць аб'ём матэрыялаў, што вручна для транспартавання і выкарыстання. Брыкетуюць дробны вугаль, руду, харчовыя прадукты, торф і інш. з дабаўленнем клейкіх рэчываў ці без іх. Б. торфу ў СССР пачалося ў 1937, калі быў пабудаваны першы торфабрыкетны (т/б) з-д у Арэхава-Зуеве. На Беларусі першыя т/б з-ды пачалі будаваць у 1939—40 на торфапрадпрыемствах (т/п) «Дабееўскі Мох», «Луцкае», «Усяж» і «Усвіж Бук». У вайну гітлераўцы знішчылі пабудовы. Пасля 1945 на т/п імя Арджанікідзе, «Сіні Востраў», «Дзяржынскае» і «Дабееўскі Мох» пабудаваны з-ды, якія ў 1947 выпусцілі 4,5 тыс. *т* брыкетаў. У 1969 на Беларусі было 35 т/б з-даў, гадавы выпуск брыкетаў і паўбрыкетаў на іх склаў каля 2 млн. *т* (35% вытворчасці па СССР). Сыравіна для брыкетаў — фрэзерны торф вільготнасцю 35—50%. На т/б з-дах Беларусі («Бярэзінскае», «Верцялішкі», «Луцкае», «Радзівава», «Усяж» і інш.) тэхналаг. працэс Б. ўключае драбленне фрэзернага торфу, прасяванне, сушку і прасаванне (звычайна без клейкіх рэчываў). Дробяць торф малатковай драбілкай або шахтавым млынам. На рашотах торф сартуюць, каб атрымаць фракцыі да 8 *мм*. Пнеўмапаравадзяныя або парагазавыя сушылкі зніжаюць вільготнасць тарфяной крошкі да 10—16%. Прасуюць торф на крывашыпна-шатунных і каленчата-рычажных штэмпельных прэсах з адкрытай матрыцай. На т/б з-дах БССР ужыва-



ецца двухштэмпельны крывашыпна-шатунны прэс Б8232 (гл. рыс.). Асн. характарыстыкі: намаганне штэмпеля 160 *т*, частата прасавання 75—100 хадоў штэмпеля за мінуту, прадукцыйнасць прэса да 25 тыс. *т* брыкетаў у год і больш. У рэспубліцы выпускаюцца і тарфяныя паўбрыкеты (з-ды «Чырвоная Зорка», «Краснае», імя 16 Чырвоных партызанаў і інш.).

Тарфяныя брыкеты і паўбрыкеты робяцца ў выглядзе прызмаў з закругленымі вугламі і маюць памеры: брыкеты даўж. 80—200, шыр. 40—75, таўшч. 20—70 *мм*, паўбрыкеты даўж. 90—130, шыр. 45—75, таўшч. 20—50 *мм*. Насыпная маса тарфяных брыкетаў 600—750 *кг/м*³, шчыльна складзенага 900—1000 *кг/м*³. Вільготнасць брыкетаў ад 14 (марка БТ-1) да 18% (БТ-3). Вільготнасць паўбрыкетаў да 28%. Попельнасць брыкетаў 10 (БТ-1) і 20% (БТ-3), паўбрыкетаў 20%. Па цеплатворнай здольнасці 1 *т* брыкету раўнацэнная 0,5 *т* каменнага вугалю (антрациту) або 3,5 *м*³ дроў. Брыкетуюць таксама дробныя кавалачкі вугалю памерам да 6 *мм* і вугальны пыл. У шыхту дадаюць каменнавугальны пек, нафтавы бітум. Б. рудныя дробязі і калашніковага пылу робяць пасля змешвання са смалою, пекам або каўстычным магнезітам. Прасуюць пад ціскам да 500 *ат*. Брыкеты абпальваюць. В. металічнай стружкі змяшае ля аб'ём у 5—7 разоў, што памяншае аграрнае стружкі пры перапрацоўцы. У метал. стружку дадаюць 6—8% вадкага шкла і прасуюць пад ціскам 300—400 *ат*, а без клейкіх рачываў пад ціскам да 3000 *ат* на гарыз. крывашыпных прэсах.

Літ.: Наумович В. М. Теоретические основы процесса брикетирования торфа, Мн., 1960; Булынко М. Г. и Петровский Е. Е. Технология торфобрикетного производства, М., 1968; Равич Б. М. Брикетирование руд и рудотопливных шихт, М., 1968. *М. У. Кіслоў.* Мінск.

БРЫЛЁЎ Мікіта Рыгоравіч [15(27).5.1896, в. Лучын Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 16.8.1955], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1939. У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з 1918. Ваяваў на Туркестанскім фронце. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1933). З ліп. 1941 на Зах., Бранскім, Цэнтр., Бел. і 4-м Укр. франтах: нам. камандзіра і камандзір дывізіі, нач. штаба арміі. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Беларусі (Чавусаў, Прапойска, Рагачова, Магілёва, Мінска, Гродна), Чэхаславакіі. З 1945 у апараце Мін-ва абароны. У 1951—53 нач. кафедры. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі.



БРЫЛЬ, мужчынскі капялюш на Беларусі. Летні Б. звычайна з шырокімі палямі, нізкай тульяй рабілі з саломы, чароту, лазы. Лямцавы Б. з высокай тульяй найбольш пашыраны ў вах. абласцях Беларусі. Вакол тулы завязвалі сплеценую з конскага воласу тасьму, у кутасы якой упляталі каляровую суконную стужку. Б. шырока бытаваў яшчэ ў пач. 20 ст.





БРЫЛЬ Янка [Іван Антонавіч; н. 22.7(4.8). 1917, Адэса], беларускі савецкі пісьменнік. З сям'і чыгуначніка. У 1922 пераехаў з бацькамі на іх радзіму (в. Загор'е Стаўбцоўскага пав.). Скончыў польскую сямігодку, працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. У 1939 прызваны ў польскую армію. Служыў у марской пяхоце. У вер. 1939 трапіў у нямецкі палон, адтуль увосень 1941 уцёк на радзіму. З кастр. 1942 сувязны партыз. брыгады імя Жукава, в сак. 1944 рэдактар газ. «Сцяг свабоды» [орган Мірскага падпольнага РК КП(б)Б]. З канца 1944 у Мінску; працаваў у час. «Вожык», «Маладосць», «Полымя». Друкуецца з 1938. Першыя аб. «Апавяданні» (1946), «Нёманскія казакі» (1947) пра даваенную зах.-бел. вёску і партыз. барацьбу. Апавяданням уласцівыя псіхалагізм, паэтычнасць, лірычны гумар, каларытная нар. мова. Аповесць «У Забалоцці днее» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1952) пра стварэнне, першыя поспехі зах.-бел. калгасаў, абнаўленне характару людзей, станаўленне сацыяліст. адносін. У лірычнай аповесці «На Быстранцы» (1954) паказаў жыццё калгаснай вёскі ў 50-я г. Перажыванні чалавека, пастаўленага ў складаныя грамадска-псіхал. абставіны, даследуе ў аповесці «Апошняя сустрэча» (1959), апавяд. «Галя», «Адзін дзень», «Memento mori» і інш. Героям зах.-бел. падполля — камуністам П. Жалезняковічу і Р. Сяржанту — прысвяціў нарысы «Сэрца камуніста» і «Партрэт старэйшага таварыша». Роздум мастака пра фашызм і народ, чалавека і радзіму — у рамане «Птушкі і гнёзды» (1963). Літ.-эстэт. погляды Б. выказаны ў аб. артыкулаў «Роздум і слова» (1963), кн. лірычных мініяцюр «Жменя сонечных промняў» (1965). Пераклаў на бел. мову паасобныя творы Л. Талстога, А. Чэхава, І. Крылова, М. Горкага, П. Бажова, І. Друцэ, А. Вішні, В. Каваčэнкі, М. Канапніцкай, Л. Кручкоўскага, Т. Ружэвіча, У. Махэка і інш. Творы Б. перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжой. За аб. апавяд. «Працяг размовы» (1962) атрымаў літ. прэмію імя Я. Коласа (1963). Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл., старшыня Бел. аддз. Т-ва СССР—Канада, з 1966 сакратар праўлення СП БССР. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Збор твораў, т. 1—2, Мн., 1960; Збор твораў, т. 1—4, Мн., 1967—68.

Літ.: Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 2, Мн., 1966; Канэ Ю. Янка Брыль, М., 1964; Гусева Л. Янка Брыль — мастак, Мн., 1968; Майхровіч С. Янка Брыль, Мн., 1968; Каваленка В. Абавязак перад часам, у кн.: На высокай хвалі, Мн., 1968; Гардзіцкі А. Дыялогі, Мн., 1968, с. 35—46; Ватацы Н. Б. Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі (1917—1960). Бібліягр. асобных выданняў, Мн., 1962; Zídlický V. i Genyk-Berezovská Z. Současná sovětská literatura, [t.] 3 — Ukrajinská a běloruská, Praha, 1966, s. 199—209. *У. А. Калеснік.* Брэст.

БРЫЛЬКІ, вёска ў Валожынскім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «17 верасня». За 4 *км* на У ад Валожына, 76 *км* ад Мінска. 435 ж., двароў 134 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БРЫЛЬЯНТ (франц. brillant бліскучы), чысты, штучна агранёны алмаз у выглядзе дзвюх зрэзаных шматгранных пірамід. Колькасць граняў да 58. Адрозніваюцца масай (вымяраецца ў каратах), формай (чатырохвугольная, круглявая, авальная і інш.), вясёлкавым зіхаценнем колераў і інш. Найбольш буйныя Б. маюць уласныя назвы. Каштоўны камень 1-га кл.

БРЫЛЬЯНТАВЫ ЗЯЛЁНЫ, антысептычны сродак і аналітычны рэактыў. Аксалат тэтраэтыл-дыяміна-трыфенілметану. Залаціста-зялёны парашок. Ужываецца ў 0,1—5% спіртавым ці водным растворах і ў мазях супраць гнайнічкавых хвароб скуры, блефарыту, гнойных ран, апёкаў; для абеззаражвання інструментаў, афарбоўкі эрытрацытаў і ў фотаметрычным аналізе. Гл. таксама *Антысептычныя сродкі.*

БРЫНЕЛЯ МЕТАД, спосаб вызначэння цвёрдасці металаў. На прэсах Брынеля на пробу металу, паверхня якой адшліфавана, уціскаюць стальны шарык дыяметрам 10, 5 або 2,5 *мм*. Нагрузка на шарык даецца адпаведна 3000, 750 і 187,5 *кГ*. Вымяраюць у мілімétрах дыяметр ямкі ад шарыка і па табліцах знаходзяць цвёрдасць металу ў адзінках паводле Брынеля (НВ *кГ/мм*²).

БРЫНЕВА, чыг. ст. на лініі Брэст—Гомель, вёска ў Марохараўскім с/с Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. За 10 *км* на У ад Жыткавіч, 228 *км* ад Гомеля. 37 ж., двароў 12 (1970).

БРЫНЁЎ, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Брынёў». За 27 *км* на ПнЗ ад Петрыкава, 214 *км* ад Гомеля, 10 *км* ад чыг. ст. Капцэвічы, 10 *км* ад прыстані Ляскавічы (на Прыпяці). 1693 ж., двароў 489 (1970). Лясніцтва, вытв. ўчасткі леспрамгаса і хімлясгаса. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны.

БРЫНСКІ Антон Пятровіч [н.10(23).6.1906, с. Андрэеўка Камянец-Падольскага пав. Падольскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1927. У Чырв. Арміі з 1928; скончыў кавалерыйскае вуч. (1931), курсы «Выстрал» (1945), курсы камандзіраў палкоў, камандзіраў дывізій пры Акадэміі імя Фрунзе (1952). У Айч. вайну (з ліп. 1941 да крас. 1944) у распараджэнні Ген. штаба Чырв. Арміі, выконваў спец. заданні ў тыле ворага. З кастр. 1941 камандзір асобага атрада, які рабіў дыверсіі на чыг. Барысаў — Орша, з ліп. 1942 на Пн ад Мінска; вёў дыверсійна-разведвальную работу на Брэсцкім, Баранавіцкім і Лунінецкім чыг. вузлах; стварaў партыз. асобыя атрады і групы. З ліст. 1942 у зах. абласцях Украіны, дзе з 1943 камандзір партыз. злучэння асобага прызначэння. З крас. 1944 у Маскве. З 1955 палк. Б. ў запасе. Аўтар кніжак «На той бок фронту», кн. 1—2, 1954—1959, «Хлопчык у клятчастай кепцы» (1960), «Партызанскі кур'ер» (1961), «Баявыя спадарожнікі мае» (2 выд., 1969). Чл. Саюза пісьменнікаў СССР, Савецкага камітэта ветэранаў вайны. Жыве ў Горкім.



Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 146—156. *В. С. Семенякоў.* Мінск.

БРЫСБЕН (Brisbane) горад на У Аўстралійскага Саюза, адм. ц. штата Квінсленд. Порт на р. Брысбен, недалёка ад упадзення яе ў зал. Мортан. Даступны марскім суднам. Чыг. вузел. 795 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1967). Ваенная, металург., аўтазборачная, тэкст. прамысловасць. Вытв. чыг. абсталявання, верфі, бойні. Ун-т (з 1909), музеі.

БРЫСТАЛЬ, Брыстал (Bristol), горад і марскі порт на ПдЗ Англіі на р. Эйван каля Брыстольскага заліва. Вузел чыгунак і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 428 тыс. ж. (1968). Авіяцыйная, суднарамонтная і суднабудаўнічая, палігр., папяровая, мукамольная і хім. прамысл.; аўтамабіле- і маторабудаванне, каляровая металургія, нафтаперапрацоўка. Цукра-рафінадная, шакаладная, тытунёвая галіны прамысловасці працуюць на імпартнай сыравіне. Ун-т (з 1909).

БРЫТАНІЯ (лац. Britannia), адна з старажытных назваў сучаснай Англіі (*Вялікабрытаніі*). Паходзіць ад назвы аднаго з кельцкіх плямёнаў — брытаў, якія насялялі Б. ў 8 ст. да н. э.— 5 ст. н. э. З 43 н. э. рымская правінцыя (Britannia Romana). Назва Англія ўсталявалася пасля *англа-саксонскага завалявання* (5—6 ст.).

БРЫТАНСКАЯ ІМПЕРЫЯ (British Empire), абазначэнне сукупнасці *Вялікабрытаніі* і яе каланіяльных і паўкаланіяльных уладанняў.

Шырокую калан. экспансію Англія пачала ў перыяд станаўлення капіталізму ў краіне (17 ст.), але першыя тэр. захопы былі яшчэ ў 12 ст. (заваяванне Ірландыі). У войнах 17 ст. з Галандыяй, 1701—14 з Іспаніяй, *Семігадовай вайне* 1756—63 Англія дамаглася панавання ў Паўн. Амерыцы, завалодала Канадай, Гібралтарам, Ямайкай, пачала завaёўваць Індыю. Да 60-х г. 18 ст. асноўі Б. і. былі закладзены. Калоніі, гандаль рабамі давалі дадатковыя крыніцы для ўзбагачэння англ. буржуазіі, індустрыялізацыі краіны. У выніку *вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83* ад Б. і. аддзялілася 13 паўн.-амер. калоній, якія ўтварылі ЗША. Гэтыя страты Англія кампенсавала за кошт новых тэр. захопаў канца 18 — пач. 19 ст. *Венскі кангрэс 1814—15* замацаваў за ёю а-вы Мальта і Цэйлон, Капскую калонію на Пд Афрыкі і інш. тэр. У 1-й пал. 19 ст.

вялася каланізацыя Аўстраліі і Новай Зеландыі, у асноўным завяванна Індыі, захоплены кіт. в-аў Сянган (Ганконг), Англія дамаглася шэрагу прывілей у Кітаі (гл. *Англа-кітайская вайна 1840—42* і *Англа-франка-кітайская вайна 1856—60*). Каб умацаваць сваё панаванне ў Індыі, якое пахіснулася ў гады *індыйскага народнага паўстання 1857—59*, каланізатары змянілі сістэму кіравання, ліквідавалі (1858) Ост-Індскую кампанію (гл. *Ост-Індскія кампаніі*). У 1876 англ. каралева абвешчана імператрыцай Індыі. Прыкладна ў гэты перыяд стаў афіц. ужывацца тэрмін Б. і. Асабліва шпаркімі тэмпамі англ. калан. экспансія развівалася ў апошняй трэці 19 ст., калі вызначыўся пераход да імперыялізму. За 1860—99 тэр. Б. і. павялічылася больш як у 4,5 раза. У барацьбе за падзел свету Англія далучыла да сваіх уладанняў у Афрыцы Бечуаналенд, Занзібар, Залаты Берег, Зулуленд, Кенію, Ньясаленд, Паўн. Нігерыю, Паўн. і Паўд. Радэзію, Самалі, Уганду, рэспублікі Аранжавую і Трансвааль (гл. *Англа-бурская вайна 1899—1902*); у Азіі завявала Бірму, п-аў Цзюлун (Каулун) і порт Вэйхайвэй, фактычна ўстанавіла пратэктарат над Афганістанам. У канцы 19 — пач. 20 ст. Вялікабрытанія стала велізарнай калан. імперыяй, у якой побач са старымі метадамі эксплуатацыі (неэквівалентны гандаль, падаткі і адм. паборы) пачаў расці вываз капіталу ў калоніі, дзе ён даваў найбольшыя прыбыткі. Хуткае развіццё капіталізму ў т. зв. перасяленчых калоніях, дзе значную частку насельніцтва складалі еўрапейцы, імкненне гэтых калоній да самавызначэння вымусілі англ. буржуазію пайсці на ўступкі. Статус самакіравальных дамініёнаў атрымалі Канада (1867), Аўстралійскі Саюз (1901), Новая Зеландыя (1907), Паўд.-Афрыканскі Саюз (1910). Саюз брыт. імперыялізму і буржуазіі перасяленчых калоній мацаваўся на сумесным заняволенні «каляровых» народаў, у адносінах да якіх ажыццяўляўся рэжым няшчаднага расавага і сац. прыгнёту. Развіццё імперыялізму абвастрыла барацьбу за перадзел свету. Пасля 1-й сусв. вайны ў Б. і. як падмандатныя тэр. ўвайшлі: Ірак, Палесціна, Танганьіка, Трансіарданія, частка Тога і Камеруна. У паўкаланіяльную залежнасць ад Англіі трапілі некат. інш. тэр. Блізкага і Сярэд. Усходу, якія фармальна не ўваходзілі ў Б. і. Мандаты атрымалі і брыт. дамініёны: Паўд.-Афрыканскі Саюз на Паўд.-Зах. Афрыку, Аўстралійскі Саюз на частку Новай Гвінеі і прылеглыя а-вы Акіяніі, Новая Зеландыя на а-вы Зах. Самоа. У гады вайны гасп. сувязі дамініёнаў і метраполіі паслабелі. Англія мусіла прызнаць іх права на самастойную знешнюю палітыку. Дамініёны ўдзельнічалі ў падпісанні *Версальскага мірнага дагавору 1919*, сталі членамі Лігі Нацый. Агульны крызіс капіталізму, які паглыбіўся пад уплывам Кастр. рэвалюцыі, выклікаў уздым нац.-вызв. руху. Пад яго націскам статус дамініёна атрымала ў 1921 Ірландыя (без правінцыі Ольстэр), Англія прызнала незалежнасць Афганістана (канчаткова ў 1921), фармальна Егіпта (1922), Ірака (1930), дала больш самастойнасці дамініёнам (у 1931 прызнала іх поўную незалежнасць у знешняй і ўнутранай палітыцы). Але роля калоній у эканоміцы і палітыцы Англіі заставалася надзвычай вялікая. Усе яны былі базай сыравіны для метраполіі, уваходзілі ў адзіную сістэму «імперскай абароны». У стратэгічна важных раёнах Б. і. размяшчаліся базы англ. арміі і флоту. У 1938 амаль 55% замежных капіталаўкладанняў Англіі прыпадала на краіны Б. і.

Рэвалюц. працэс, што разгарнуўся ў гады і пасля 2-й сусв. вайны, прывёў да крушэння калан. сістэмы імперыялізму і фактычнага распаду Б. і. Паліт. незалежнасці дамаглася Індыя (паводле рэліг. адрозненняў падзелена на Індыю і Пакістан — дамініёны з 1947; Індыя — рэспубліка з 1950, Пакістан — з 1956), ад калан. прыгнёту вызваліліся Бірма і Цэйлон (1948), Ірландыя (1949). У 60-я г. 20 ст. пачаўся магутны працэс вызвалення Афрыкі. Незалежнымі сталі Судан (1956), Гана (1957), Самалі і Нігерыя (1960), Танганьіка і Сьера-Леоне (1961), Уганда (1962), Занзібар, Кенія (1963) і г. д. Тэр. калан. уладанняў Англіі скараціласа з 14,5 млн. км² з нас. 454 млн. чал. (1938) да менш за 1 млн. км² з 12 млн. чал. (на 1968). Аднак Англія астаецца вялікай калан. дзяржавай з уладаннямі ва ўсіх частках свету. Ей належаць: у Еўропе — Гібралтар; у Азіі — Бахрэйн, Бруней, Катар, Сянган (Ганконг); у Афрыцы — Сейшэльскія а-вы, в-аў Св. Алены; у Амерыцы — Багамскія, Бермудскія, Віргінскія Брытанскія, Кайманавы, Фалклендскія а-вы, Гандурас Брытанскі, Мантсерат, Цёркс і Кайкас; у 1967 атрымалі статусы «асацыраваных з Англіяй дзяржаў» Антыгуа, Сент-Крыстофер — Невіс — Ангілья, Сент-Люсія, Грэнада і Дамініка а-вы, у 1969 — Сент-Вінсент; у Акіяніі — Гілберта і Эліс, Піткэрн, Саламонавы, Фіджы а-вы; Новыя Гебрыды — кандамініум Вялікабрытаніі і Францыі; у Антарктыцы — Брыт. антарктычная тэрыторыя. Англ. імперыялісты імкнуцца захаваць свой эканам. і паліт. ўплыў у залежных краінах і краінах, якія вызваліліся, выкарыстоўваюць палітыку сілы і ўступак, каб схіліць на свой бок нац. буржуазію, дэзарганізаваць нац.-вызв. рух. Адна з адзнак такой палітыкі — замена тэрміна Б. і. тэрмінам Брыт. садружнасць нацый, потым Садружнасць (афіц. дакументамі вызначаецца як свабодная асацыяцыя суверэнных дзяржаў разам з залежнымі ад іх тэрыторыямі). Члены Садружнасці (на кастр. 1969): Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўн. Ірландыі, Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя з 1931; Індыя, Пакістан з 1947; Цэйлон з 1948; Гана, Малайзія (да 1963 Малая) з 1957; Нігерыя з 1960; Кіпр, Сьера-Леоне з 1961; Танзанія (Танганьіка з 1961, Занзібар з 1963); Трынідад і Табага, Уганда, Ямайка з 1962; Кенія з 1963; Замбія, Малаві, Мальта з 1964; Гамбія, Сінгапур з 1965; Барбадас, Батсвана, Гаяна, Лесота з 1966; Науру, Маўрыкій, Свазіленд з 1968. Члены Садружнасці настойліва заяўляюць пра свае інтарэсы, дамагаюцца ўмацавання паліт. і эканам. незалежнасці, выступаюць супраць палітыкі неакаланіялізму, якую ажыццяўляе Вялікабрытанія.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 9, с. 130—136, т. 12, с. 270—273, 296—299; Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Ерофеев Н. А. Закат Британской империи, М., 1967; Политика Англии на Ближнем и Среднем Востоке (1945—1965), М., 1966; Политика Англии в странах Южной и Юго-Восточной Азии, М., 1966; Тарабрин Е. А. Стратегия и тактика неоколониализма Англии, М., 1969; Датт Р. П. Кризис Британии и Британской империи, пер. с англ., М., 1959.

Л. М. Шнеерсон. Мінск.

БРЫТАНСКАЯ РАДЫЁВЯШЧАЛЬНАЯ КАРПАРАЦЫЯ [British Broadcasting Corporation (BBC); скарочана Бі-Бі-Сі], падкантрольная ўраду арганізацыя, якая вядзе радыёвяшчанне і некамерцыйнае тэлебачанне Вялікабрытаніі. Засн. ў 1927. Вяшчанне больш чым на 30 мовах свету. Мае групы ўнутр. вяшчання, заруб. перадач, навін, вусной прапаганды, тэлебачання. Выкарыстоўваецца імперыяліст. коламі Вялікабрытаніі для прапаганды супраць краін сацыялізм.

садружнасці, супраць нац.-вызв., рабочага і камуніст. руху. Бі-Бі-Сі звязана дагаворам з англ. разведвальнай службай Інтэліджэнс Сервіс (Intelligence Service).

Літ.: Стрепетов В. И. Зловещая паутина, Л., 1965, с. 56—57; Силантьев В. И. Ядовитые пилюли на экспорт, М., 1967.

Р. А. Ткачук. Мінск.

БРЫТАНСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ (Encyclopaedia Britannica), англа-амерыканская энцыклапедыя.

1-е выд. выпушчана ў 1768—71 у трох тамах у Эдынбургу т. зв. Т-вам джэнтльменаў Шатландыі; мела гуманітарны і прыродазнаўчы кірунак. 2-е выд. (1776—84, 10 т.) дапоўнена гістар. і біягр. матэрыяламі. 3-е выд. (18 т.) выйшла ў 1788—97, 4-е (20 т.) у 1801—10. З-за фін. цяжкасцей выданне пераходзіла з рук у рукі. Пасля 1-й сусв. вайны ў Б. э. ўсё большую ролю адыгрываюць амер. выдаўцы і рэдактары. У 1929 14-е выд. (перапрацаванае) выйшла ў 24 т. у Лондане і Нью-Ёрку. Пасля 1929 у Б. э. перыядычна абнаўляецца толькі калля ⅛ агульнай колькасці артыкулаў. З 1945 яна выдаецца ў Лондане, Чыкага і Таронта. У матэрыялах пра сацыялісг. краіны дапускае мноства гістар. недакладнасцей і скажэнняў. Напр., у артыкуле пра Беларусь у раздзеле пра станаўленне Сав. улады і развіццё БССР Б. э. губляе дэкларавапую ёю «аб'ектыўнасць», фальсіфікуе гісторыю. Звесткі па эканоміцы і культуры рэспублікі мізэрныя, не адлюстроўваюць поспехаў, якіх дасягнуў беларускі народ за гады Савецкай улады.

Л. С. Бараноўскі, Дз. Дз. Козікіс. Мінск.

БРЫТАНСКІ МУЗЕЙ у Лондане, самы вялікі англійскі нацыянальны музей. Створаны ў 1753. Аддзелы: егіпецкі (найвялікшая калекцыя папірусаў, фрэскі Новага царства, Разецкі камень), Б. Усходу (асірыйская скульптура, клінапісныя тэксты), грэка-рымскі (мармуры Парфенона, ант. вазы), далёкаўсходні (кітайскія лакі і бронзы, скульптура Гандхары), брытанскі (археал. помнікі з тэр. Брытаніі) і б-ка (больш за 6 млн. кніг, вялікі збор папірусаў і інш.), у публічнай чытальнай зале якой працавалі К. Маркс, Ф. Энгельс, У. І. Ленін. У фондах Б. м. бел. выданні Ф. Скарыны («Кнігі царстваў», Прага, 1518; «Псалтыр», «Апостал», Вільня, 1525) і «Манархія турэцкая» П. Рыко (Слуцк, 1678).

БРЫТАНСКІЯ АСТРАВЫ, архіпелаг на ПнЗ Еўропы, паміж Атлантычным ак. і Паўночным м. Ад мацерыка аддзяляецца пралівамі Ла-Манш і Па-дэ-Кале. Пл. 325 тыс. км². Два вялікія (Вялікабрытанія і Ірландыя) і шэраг невялікіх а-воў і архіпелагаў (Гебрыдскія, Шэтландскія, Аркнейскія). Берагі моцна парэзаныя. Нізіны і сярэдневышынныя горы выш. да 1343 м. На Б. а. размешчаны дзяржавы *Вялікабрытанія* і *Ірландыя*.

БРЫТАЎ Іван Якаўлевіч (н. 3.9.1924, в. Жохава Уладзімірскай губ.), дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Бел. дзярж. ін-т нар. гаспадаркі імя Куйбышава (1965). У 1942—47 і 1952—54 у Сав. Арміі. У 1949—52 нач. здабычы торфу торфапрадпрыемства «Дупілава» Яраслаўскай вобл., у 1954—60 дырэктар торфапрадпрыемства «Светлагорскае» Гомельскай вобл. У 1969—70 нач. Упраўлення мясцовай прамысл. Гомельскага аблвыканкома. З 24.2.1970 міністр тарфяной прамысловасці БССР. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

БРЫТЭН (Britten) Бенджамін (н. 22.11. 1913, Лоўстафт, графства Сафалк), англійскі кампазітар, піяніст, дырыжор, грамадскі дзеяч. Адзін з арганізатараў англ. оперпай групы (1947) і штогодняга фестывалю ў Олдбара (1948), прызначаных прапагандаваць нац. муз. мастацтва. У сваёй багатай на жанры творчасці імкнецца да пастаяннага кантакту са слухачом. Абнаўленне сродкаў выразнасці спалучае з вернасцю нац. традыцыям. Оперы «Пітэр Граймс» (1945), «Ганьбаванне Лукрэцыі» (1946), «Альберт Херынг» (1947), дзіцячая «Давайце ставіць оперу» (1949), «Сон у летнюю ноч» (1960) і інш. сведчаць пра адраджэнне айч. муз. т-ра. Асобнае месца займае грандыёзны «Ваенны рэквіем» (1961; у 1968 выконваўся ў Мінску). З інш. твораў: «Вясновая сімфонія» (1949), Варыяцыі і фуга на тэму Пёрсела (1945), інстр. канцэрты, апрацоўкі нар. песень. Б. няраз наведваў СССР, творча звязаны з многімі сав. музыкантамі.

Літ.: Таурагис А. Бенджамин Бриттен, М.—Л., 1965.

БРЫЦА, курынае проса (Echinochloa crus galli), аднагадовая травяністая расліна сям. злакавых. Сцябло — саломіна выш. да 1—2 м. Лісце шырокалінейнае, па краі шурпатае. Каласкі сабраны ў сціслую мяцёлку. Плады — зярняўкі, пры выспяванні лёгка асыпаюцца. Расце як пустазелле на палях (у прапашных культурах), агародах, па берагах рэк. Пашырана ў гарачых і ўмераных зонах абодвух паўшар'яў, асабліва ў паўночным. На Беларусі — нар. назва петушынай голені. Маладыя расліны выкарыстоўваюцца на корм жывёле.

БРЫЦАЛАВІЧЫ, вёска ў Ліпеньскім с/с Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., на р. Свіслач. За 15 км на ПнУ ад Асіповіч, 121 км ад Магілёва, 3 км ад чыг. ст. Брыцалавічы. 180 ж., дваroў 71 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У Айч. вайну ням.-фаш. акупанты спалілі вёску, загубілі яе жыхароў. Брацкая магіла 676 сав. грамадзян — ахвяр фашызму.

БРЫЧКА, старадаўняя лёгкая павозка. Верх — будан, звычайна плецены з лазы або абцягнуты скурай.

БРЫЧОНАК Роберт Іванавіч [н. 5(17).1. 1893, Пецярбург], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. артылерыі (1945). Беларус. З сялян. Чл. КПСС з 1937. Скончыў тэхн. вуч. (1912), Елізаветградскае кав. вуч. (1915). У ліст. 1917 у Чырв. гвардыі, з лютага 1918 у Чырв. Арміі. Удзельнік ліквідацыі контррэвалюц. паўстання ў г. Луга (у 1917—18), змагаўся супраць Юдзеніча (у 1919), бандаў Махно (у 1920—21). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. З 1940 нач. ар-



тылерыі стралк. дывізіі. З чэрв. 1941 на Паўд., Волхаўскім, Ленінградскім, 4-м Укр. франтах: нач. артылерыі дывізіі, камандуючы артылерыі арміі. Удзельнік абароны Ленінграда, вызвалення Польшчы. Пасля вайны камандуючы артылерыі ваен. акругі. У 1946—53 нач. артыл. вуч. Узнаг. ордэнам Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнамі ПНР. Жыве ў Ленінградзе.

БРЫЯЛОГІЯ (грэч. bryon драўняны мох+ +...логія), навука пра імхі. Уключае сістэматыку, экалогію, фізіялогію, цыталогію, геаграфію мохападобных раслін. Выкарыстоўвае апісальныя і эксперымент. метады даследавання. У БССР пытанні Б. распрацоўвае Ін-т эксперым. батанікі АН БССР (эколага-дэнатычнае вывуч. мохападобных).

Літ.: Лазаренко А. С. Определитель лиственных мхов БССР, Мн., 1951; Пидопличко А. Флора сфагновых (торфяных) мхов Белорусской ССР, Мн., 1948.

БРЭГМАН Авель Пінхусавіч [30.3(12.4). 1906, в. Людзяневічы Мазырскага пав. Мінскай губ.— 30.5.1958], беларускі савецкі архітэктар, педагог. Пасля сканчэння ў 1936 Маск. арх. ін-та пераехаў у Мінск. У 1941—45 працаваў у Куйбышаве. З 1945 у Мінску: кіраўнік майстэрні Белдзяржпраекта, выкладчык Мінскага арх.-буд. тэхнікума (1946—58). Работы: у Магілёве — гасцініца, жылыя дамы (1931—41, з А. Воінавым); у Мінску — ін-т фізкультуры (1938, з Воінавым), жылыя дамы на Ленінскім праспекце (1948—51), будынкі інтэрната Мінскай вышэйшай парт. школы па вул. К. Маркса (1950), Белпрамсавета і Прамэнергапраекта (1953—55), тэхналагічнага ін-та (1956, з В. Ладыгінай). У 1937—41 старшыня праўлення Саюза архітэктараў БССР.

БРЭГМАН Аляксандр Абрамавіч (парт. псеўд. Жалязняк; 1895, Мазыр — 1919), удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. Чл. Камуніст. партыі з мая 1917. З ліп. 1917 чл. Бабруйскага к-та РСДРП(б). Чл. Бабруйскага Савета і камісар па харчаванні. З 15.10.1917 нач. чырвонагвардзейскай камендатуры пры Бабруйскім к-це РСДРП(б). У студз. 1918 уцёк з-пад арышту легіянераў Даўбор-Мусніцкага. У крас. 1918 Паўн.-Зах. абласным к-там РКП(б) пасланы на падпольную работу ў Беларусь, акупаваную кайзераўскімі войскамі. Адзін з стваральнікаў Барысаўскага, а з мая 1918 старшыня Магілёўскага падпольных райкомаў РКП(б). З 12.10. 1918 чл. Магілёўскага рэўкома; пасля вызвалення Беларусі ад ням. захопнікаў сакратар Магілёўскага павятовага к-та РКП(б), чл. губрэўкома. З лютага 1919 камісар брыгады Мазырскай групы войск. У час бою з польскімі інтэрвентамі трапіў у палон. Б. жывога закапалі па шыю ў зямлю, а потым адсеклі галаву.

Т. П. Плавінская. Мінск.

БРЭДНІК, вярба казіная (Salix caprea), дрэва ці высокі куст сям. вярбовых. Выш. 5—10 *м*. Лісце шчыльнае, авальнае, распускаецца пазней за кветкі. Пашыраны Б. у Еўропе і Цэнтр. Азіі. Расце ў лісцевых, хвойных і мяшаных лясах. Беларускія нар. назвы: вербалоз, івіна, лаза. Добры меданос. Кара Б. мае таніны, ідзе на дубленне скур і выраб чорнай фарбы; адвар і настой яе маюць лекавыя ўласцівасці. Драўніна ідзе на буд-ва, сталярку. Садаводы выкарыстоўваюць Б. як прышчэпку для вывядзення ніцых дэкаратыўных формаў.

БРЭДЭЛЬ (Bredel) Вілі (2.5.1901, Гамбург — 27.10.1964), нямецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. З 1917 чл. арг-цыі «Саюз Спартака», з 1919 чл. КПГ. Сын рабочага. Удзельнік *Гамбургскага паўстання 1923*. За рэвалюц. дзейнасць некалькі разоў арыштоўваўся. З 1933 вязень фаш. канцлагера, адкуль уцёк і эмігрыраваў у СССР (1934). У час нац.-вызв. вайны ў Іспаніі камісар інтэрнац. брыгады імя Э. Тэльмана (1937—39). У 1943—45 чл. антыфаш. нац. камітэта «Свабодная Германія». У 1945 вярнуўся з СССР на радзіму. Першы раман «Машынабудаўнічы завод Н. і К°» (1930), напісаны ў турме, рэалістычна паказвае жыццё ням. пралетарыяту. Лепшыя раманы «Выпрабаванне» (1935) і «Твой невядомы брат» (1937) пра ням. камуністаў — барацьбітоў супраць фашызму. Аўтар гістар. трылогіі «Родныя і знаёмыя» (1941—53). Быў чл. ЦК САПГ, прэзідэнтам Акад. мастацтваў, старшынёй Саюза пісьменнікаў ГДР. Нац. прэміі ГДР (1950, 1954).

Тв.: Бел. пер.— Розенгофская вуліца. Раман Гамбургскай рабочай вуліцы, Мн., 1933; Выпрабаванне, Мн., 1937; Ад Эбра да Волгі. Тры сустрэчы. [Уст. арт. В. «Да беларускіх чытачоў»], Мн., 1959; рус. пер.— Эрнст Тельман. Политическая биография, 2 изд., М., 1955; Отцы, М., 1961; Сыновья, М., 1964; Внуки, М., 1966; Новая глава, М., 1968.

БРЭЖНЕЎ Леанід Ільіч (нарадзіўся 19.12.1906, с. Каменскае, з 1936 Днепрадзяржынск), выдатны дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху. Генеральны сакратар ЦК КПСС, чл. Палітбюро ЦК. З сям'і рабочага-металурга. Чл. КПСС з 1931. Працоўнае жыццё пачаў з 15 гадоў. Пасля сканчэння ў 1927 Курскага землеўпарадкавальна-меліярац. тэхнікума працаваў землеўпарадчыкам у Коханаўскім р-не Аршанскай акругі; у Курскай губ. і на Урале заг. райземаддзела і нам. старшыні выканкома Бісерцкага раённага Савета, 1-м нам. нач. Уральскага абл. зямельнага ўпраўлення. У гады сацыяліст. рэканструкцыі нар. гасп. накіроўваецца на вучобу ў ВНУ. У 1935 скончыў металургічны ін-т у Днепрадзяржынску, там працуе інжынерам на металург. з-дзе, аддаючы ўсю сваю энергію і веды развіццю сав. металургіі. У маі 1937 выбіраецца нам. старшыні выканкома Днепрадзяржынскага гарсавета. З мая 1938 заг. аддзела, з лютага 1939 сакратар Днепрапятроўскага абкома КП(б) Украіны.



З першых дзён Вял. Айч. вайны Сав. Саюза 1941—45 у дзейнай арміі вядзе вялікую арганізатарскую і палітычную работу, займае пасады: нам. нач. Палітупраўлення Паўд. фронту, нач. Палітаддзела 18-й арміі, нач. Палітупраўлення 4-га Укр. фронту. У 1943 яму прысвоена званне генерал-маёра. Удзельнічаў у баявых аперацыях Сав. Арміі на Каўказе, у Прычарнамор'і, у Крыме, на Украіне, а таксама ў баях за вызваленне народаў Чэхаславакіі, Польшчы, Венгрыі. У 1945—46 нач. Палітупраўлення Прыкарпацкай ваен. акругі.

Пасля заканчэння Вял. Айч. вайны партыя пасылае Л. І. Брэжнева на кіруючую работу па аднаўленні нар. гасп. Са жн. 1946 першы сакратар Запарожскага, з ліст. 1947 Днепрапятроўскага абкомаў партыі. Усе свае веды, вопыт і вялікія арганізатарскія здольнасці аддае хутчэйшаму аднаўленню першынца сацыяліст. індустрыі — Дняпроўскай ГЭС імя Леніна, гіганта металургіі «Запарожсталь», нар. гаспадаркі Запарожскай і Днепрапятроўскай абласцей. У ліп. 1950 ЦК КПСС пасылае Л. І. Брэжнева на кіруючую работу ў Малд. ССР, дзе ён выбіраецца першым сакратаром ЦК КП Малдавіі. Парт. арг-цыя рэспублікі правяла ў тыя гады вялікую работу па развіцці прамысловасці, карэннай сацыяліст. перабудове с. гасп. і ўздыме культуры Малд. ССР. На XIX з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў выбраны чл. ЦК, на Пленуме ЦК (кастр. 1952) канд. у чл. Прэзідыума і Сакратаром ЦК КПСС. З сак. 1953 да лютага 1954, у званні генерал-лейтэнанта, працуе нам. нач. Гал. палітупраўлення Сав. Арміі і ВМФ.

У перыяд, калі партыя, вырашаючы задачы далейшага ўздыму с. гасп., разгарнула ў шырокіх маштабах асваенне цалінных і абложных зямель, ЦК КПСС накіроўвае Л. І. Брэжнева ў Казахстан, дзе яго выбіраюць другім (люты 1954), а потым першым сакратаром ЦК КП Казахстана (жн. 1955).

На XX з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў выбраны чл. ЦК КПСС, на Пленуме ЦК КПСС (люты 1956) — канд. у чл. Прэзідыума і Сакратаром ЦК КПСС, адначасова з 1958 нам. старшыні Бюро ЦК КПСС па РСФСР. З чэрв. 1957 чл. Прэзідыума ЦК КПСС. Па даручэнні ЦК займаўся пытаннямі развіцця цяжкай прамысл. і буд-ва, аснашчэння ўзброеных сіл краіны найноўшай баявой тэхнікай, развіцця касманаўтыкі. На V сесіі Вярх. Савета СССР 5-га скл. (май 1960) выбраны Старшынёй Прэзідыума Вярх. Савета СССР, знаходзіўся на гэтай пасадзе да чэрв. 1964, адначасова з чэрв. 1963 Сакратар ЦК КПСС. На пасадзе кіраўніка Сав. дзяржавы ён вядзе вялікую работу па ўдасканаленні дзярж. апарату, развіцці сацыяліст. дэмакратыі і ўмацаванні законнасці, ажыццяўленні ленінскай знешняй палітыкі.

Гістарычнае месца ў жыцці партыі і краіны займае кастр. (1964) Пленум ЦК КПСС, у рабоце якога Л. І. Брэжнеў прымае актыўны ўдзел. На кастр. Пленуме ЦК, які выказаў непахісную волю партыі строга захоўваць і развіваць ленінскія нормы парт. жыцця і прынцыпы кіраўніцтва, ён быў выбраны Першым сакратаром ЦК КПСС. У ліст. 1964 зацверджаны Старшынёй Бюро ЦК КПСС па РСФСР. У сак. 1965 на Пленуме ЦК КПСС выступіў з дакладам, у якім была выкладзена па сутнасці новая эканам. палітыка партыі ў вёсцы, сфармуляваны найважн. кірункі развіцця с.-г. вытворчасці. На майскім (1966) Пленуме ЦК КПСС прапанаваў шырокую праграму меліярац. работ як адно з гал. звенняў паскоранага развіцця с. гасп. краіны.

На XXIII з'ездзе КПСС (сак.— крас. 1966) Л. І. Брэжнеў выступіў са справаздачным дакладам ЦК, у якім дадзены глыбокі марксісцка-ленінскі аналіз сучаснага міжнар. становішча, выпікаў развіцця краіны, вызначаны гал. задачы 5-гадовага плана развіцця нар. гасп. СССР на 1966—70 і асн. прынцыпы сав. знешняй палітыкі. У дакладзе і рашэннях з'езду атрымалі далейшае развіццё многія важныя пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі і практычнай дзейнасці КПСС. XXIII з'езд выбраў Л. І. Брэжнева чл. ЦК КПСС, а пасля з'езду Пленум ЦК — Генеральным сакратаром ЦК КПСС.

З ліст. 1967 на сумесным урачыстым пасяджэнні ЦК КПСС, Вярх. Савета СССР і РСФСР Л. І. Брэжнеў выступіў з дакладам «50 гадоў вялікіх перамог сацыялізма», у якім падведзены выпікі паўвекавога сацыяліст. развіцця Сав. Саюза і вызначаны чарговыя задачы буд-ва камуніст. грамадства.

На пасадзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў паказаў сябе як паліт. дзеяч ленінскага тыпу. Маючы багаты жыццёвы вопыт і вялікі арганізатарскі талент, ён пастомна працуе над умацаваннем партыі і Сав. дзяржавы. У гэтыя гады ЦК КПСС, пры самым непасрэдным удзеле Л. І. Брэжнева, распрацаваў і ажыццявіў важныя мерапрыемствы па развіцці ленінскіх нормаў парт. і дзярж. жыцця, умацаванні прынцыпаў калектыўнасці ў рабоце, паляпшэнні кіраўніцтва нар. гасп., далейшым росце эканомікі краіны, уздыме дабрабыту і культуры працоўных, умацаванні дружбы народаў, узмацненні абароннай магутнасці Сав. дзяржавы.

Многа сіл і энергіі Л. І. Брэжнеў аддае развіццю міжнародных сувязей СССР, умацаванню сусв. сістэмы сацыялізма, барацьбе за трывалую дружбу і мір паміж народамі, згуртаванню міжнароднага камуніст. і рабочага руху, умацаванню рэвалюц. салідарнасці з працоўнымі ўсіх краін. Вялікая роля належыць яму ў падрыхтоўцы і правядзенні ў чэрв. 1969 у Маскве міжнароднай Нарады камуніст. і рабочых партый, якая азначае новы этап барацьбы народаў свету супраць імперыялізму, за мір і сацыялізм. На гэтай Нарадзе ён узначальваў дэлегацыю КПСС і выступіў ад яе імя з праграмнай прамовай.

Л. І. Брэжнеў — дэп. Вярх. Савета СССР 3—8-га скл., чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР. У чэрв. 1961 за вялікія заслугі ў раз-

віцці ракетнай тэхнікі і забеспячэнне паспяховага палёту сав. чалавека ў касм. прастору на караблі «Усход» яму прысвоена званне Герой Сац. Працы. У 1966 за вялікія заслугі перад Камуніст. партыяй і Сав. дзяржавай у камуніст. буд-ве, умацаванні абараназдольнасці краіны і вялікія заслугі ў барацьбе супраць ням.-фаш. захопнікаў на фронце Вял. Айч. вайны, у сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння Л. І. Брэжневу прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Герой ЧССР (1970). Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі, вайсковымі ўзнагародамі ЧССР і ПНР.


Тв.: Ленинским курсом, т. 1—2, М., 1970; Молодым — строить коммунизм, М., 1970.

БРЭЗАН (Brězan) Юрый (н. 9.6.1916, в. Рэкельвіц, Саксонія), сербалужыцкі пісьменнік (ГДР). Камуніст. Піша на сербалужыцкай і ням. мовах. З бедных сялян. Удзельнік антыфаш. руху, у 1939 вязень фаш. турмы ў Дрэздэне. Друкуецца з 1947. Лепшыя кнігі — зб. вершаў «Да новага часу» (1950) і зб. апавяд. «Першая баразна» (1958), «Вяртанне ў Кракаў» (1966) і інш. прасякнуты лірызмам, мяккім гумарам. У аўтабіягр. трылогіі «Фелікс Гануш» (1958—64) паказаў рост класавай самасвядомасці працоўных, станаўленне сацыяліст. ладу ў ГДР. У аповесці «Чорны млын» (1968) гістар. падзеі спалучаюцца з фалькл. матывамі лужыцкіх сербаў. На бел. мову творы Б. перакладалі Н. Гілевіч, А. Зарыцкі. Нац. прэмія ГДР (1951 і 1964).

Тв.: Бел. пер.— Крыста, Мн., 1966; [Вершы], у кн.: Там, дзе Шпрэва шуміць, Мн., 1969; рус. пер.— Повесть про девушку Трикс, ее друзей и вола Исая, М., 1960; История одной любви, М., 1969.

А. П. Траяноўскі. Мінск.

БРЭЙГЕЛЬ, Брэйгел, Старэйшы ці Мужыцкі (Bruegel de Oude, Boeren Brueghel) Пітэр [паміж 1525—30, в. Брэйгел каля Брэды (?) — 5.9.1569], нідэрландскі жывапісец і рысавальшчык. Жыў у Антверпене, з 1563 у Бруселі, там і памёр. У 1552—53 падарожнічаў па Францыі, Італіі. Працаваў у час наспявання і пач. (1566) Нідэрл. рэвалюцыі. Аўтар малюнкаў для серый гравюр (віды Альпаў, пейзажы Брабанта, алегорый «Заганы», 1557; «Дабрачыннасці», 1559).



У сатыр. бытавых сцэнах («Кухня тлустых», «Кухня худых» і інш.) Б. ужывае прыёмы гратэскавага перавелічэння, гэтым папярэднічае ўзнікненню карыкатуры ў еўрап. мастацтве. Звычайна творы Б. маюць алегарычны сэнс, звязаны з крытычным успрыманнем мастаком рэчаіснасці. Характэрныя таму часу рэліг. сюжэты чаргуюцца з бытавымі, часта ўзятымі з жыцця вёскі (адсюль празванне Б.— Мужыцкі). Датаваныя творы Б. збераглісяз 1557, сярод іх карціны: «Бітва Карнавала і Посту», «Фламандскія прыказкі» (абедзве 1559), «Дзіцячыя гульні» (1560) і інш. Трагічныя тэмы, навеяныя рэпрэсіямі ў перыяд рэвалюцыі, выражаюцца мастаком у фантаст. плане («Трыумф Смерці», каля 1562; «Шалёная Грэта», 1562), пазней набываюць характар драм. падзей сучаснасці («Вынішчэнне немаўлят», каля 1566). Песімізмам прасякнуты апошнія карціны: «Сляпыя» (сцэна пагібелі сляпых жабракоў; намёк на вынікі няведання, духоўнай слепаты — адна з асн. ідэй у творчасці Б.) і «Скокі пад шыбеніцай» (абедзве 1568). Б.— выдатны пейзажыст. Гармонія і харство прыроды паказаны ў серыі пейзажаў «Поры года» (1565). Сярод позніх твораў: «Сялянскі танец», «Сялянскае вяселле» (абедзве каля 1567). Народныя тыпы вызначаюцца сац. канкрэтнасцю, новай у тагачасным мастацтве. Творы Б. завяршаюць эпоху Адраджэння ў нідэрл. мастацтве.

Літ.: Виппер Б. Р. Становление реализма в голландской живописи XVII в., М., 1957, с. 43—67; Питер Брейгель. [Альбом, тэкст Р. Клімава], М., 1959; Всеобщая история искусств, т. 3, М., 1962, с. 360—367. Grossman F. Peeter Bruegel the elder. The Paintings, 2 ed., New York, 1966.

К. С. Ягорава. Маскв.

БРЭПТАЎСКАЯ парода свіней, парода мяса-сальнага кірунку. Выведзена ў Брэйтаўскім р-не Яраслаўскай вобл. скрыжаваннем мясцовых свіней з буйной белай, дацкай і латв. пародамі. Як парода зацверджана ў 1948. Масць белая, часам з плямамі, галава з увагнутым профілем і вялікімі абвіслымі вушамі. Сярэдняя маса 3-гадовых і старэйшых кныроў 300—350 *кг*, самак каля 250, 6-месячных падсвінкаў да 100 *кг*. Плоднасць 10—12 і больш парасят за апарос. Парода пашырана ў цэнтр. і паўн.-зах. абласцях РСФСР. На Беларусі гадуюць пераважна ў Магілёўскай, Віцебскай і Гомельскай абл. Іх гл. на ўкл. Пароды свіней да арт. *Свінагадоўля*.

БРЭКЧЫЯ (італьян. breccia ад стараж. верхненям. brecha ламанне, разбурэнне), *абломкавыя горныя пароды*, складзеныя з вуглаватых цэментаваных абломкаў памерамі больш за 1 *см* (шчэбень) рознага саставу і паходжання (асадкавыя, вулканічныя, тэктанічныя Б.).

БРЭМ (Brehm) Альфрэд Эдмунд [2.2.1829, Рэнтэндорф (Цюрынгія) — 11.11.1884], нямецкі заолаг. Вучыўся ў Іенскім ун-це. Дырэктар Гамбургскага заасада, пазней — Берлінскага акварыума. У час падарожжа па Іспаніі, Нарвегіі, Цэнтр. Афрыцы, Расіі сабраў вялікі матэрыял для шматтомнай працы «Жыццё жывёл» (1863—69), якая перакладзена на большасць еўрап. моў (на рус. ў 1866—76). Нягледзячы на слабы крытычны аналіз звестак і ачалавечванне з'яў прыроды (антрапамарфізм), кніга стала папулярнай, спрыяла развіццю цікавасці да жывёльнага свету.



Тв.: Жизнь животных по А. Э. Брему, под ред. А. Н. Северцова, т. 1—5, М., 1937—48.

БРЭМЕН (Bremen), зямля на ПнЗ ФРГ, на ніжнім цячэнні Везера. Складаецца з 2 гарадоў: Брэмена (324 *км*²) і Брэмергафена (80 *км*²), які з'яўляецца аванпортам г. Брэмена. Нас. 752 тыс. чал. (1967).

БРЭМЕН (Bremen), горад у ФРГ, адм. ц. зямлі Брэмен. Размешчаны абапал р. Везер, працягнуўся на 40 *км*. За 100 *км* ад Паўн. мора. Другі паводле значэння порт ФРГ. Вузел чыг. і шашэйных дарог, авіялініі. 604 тыс. ж. (1967). Суднабудаванне, машынабудаванне, выплаўка сталі, перапрацоўка імпартнай сыравіны: воўны, джуту, нафты, драўніны, харч. прадуктаў. Гандаль бавоўнай, віном, тытунём. Пед. ін-т, дзярж. б-ка, тэатр, карцінная галерэя, музеі. Б. упершыню ўпамінаецца ў канцы 8 ст.

БРЭНТАНА (Brentano) Луйо (18.12.1844—9.9.1931), нямецкі эканаміст, прадстаўнік т. зв. «новай гістарычнай школы» ў палітэканоміі, выразнік ідэй бурж. рэфармізму. У працах «Аб прычынах сучаснай сацыяльнай галечы» (1889), «Аграрная палітыка» (1897) і інш. спрабаваў даказаць магчымасць прымірэння класавых супярэчнасцей і «сацыяльнага міру» пры капіталізме, адстойваў ілжэнавуковы закон спаду ўрадлівасці глебы і рэакц. тэорыю ўстойлівасці дробнай сялянскай гаспадаркі. Адзін з першых прапаведнікаў «арганізаванага» капіталізму. Сцвярджаў, што картэлі — найб. эфектыўны сродак недапушчэння крызісаў. У. І. Ленін выкрыў сувязь «брэнтанізму» з міжнароднымі рэвізіянізмам, кауцкіянцтвам і «легальным марксізмам» у Расіі (гл. Тв., т. 28, с. 211).

БРЭСТ, горад на паўднёвым захадзе БССР, цэнтр Брэсцкай вобл. Вузел чыг. і шашэйных дарог, порт на р. Мухавец, аэрапорт. 122 тыс. ж. (1970).

Гістарычны нарыс. Б. (летапісны *Бярэсце*, у 17 — пач. 20 ст. Брэст-Літоўск, у 1921—39 Брэст-над-Бугам) упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе і ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1019. Археал. раскопкамі ўстаноўлена, што дзядзінец стараж. Б. размяшчаўся ў сутоку Мухаўца і Зах. Буга; тут вылучаны культурны пласт з рэчамі 11—12 ст. Гарадзішча стараж. Б. моцна пашкоджана ў 19 ст. пры буд-ве *Брэсцкай крэпасці*. Б. узнік як гандл. цэнтр і крэпасць Стараж.-рус. дзяржавы на стыку з польскімі і літ. ўладаннямі. У 11 ст. належаў князям тураўскім, кіеўскім, потым пінскім, з сярэдзіны 12 ст.— галіцка-валынскім. Горад шпраз пераходзіў з рук у рукі, быў разрабаваны і разбураны. У 1020 Б. захоплены польскім кн. Баляславам Храбрым, у 1044 вернуты Яраславам Мудрым, у 1164 ім завалодаў літ. князь Скірмунт. Пра паходы на Б. упамінае Уладзімір Манамах у сваім «Павучанні». Паводле ўскосных звестак Іпацьеўскага летапісу ў 1241 горад спалены манголамі. У канцы 13— 1-й пал. 14 ст. за *Берасцейскую зямлю* змагаліся літ. князі і польскія каралі. У 1282 берасцейскі ваявода Ціт адбіў напад мазаўшан. З 1319 Б. належаў вял. князю Вял. кн. Літоўскага Гедыміну, потым быў удзелам яго сына Кейстута. У 1348 горадам завалодаў польскі кароль Казімір III. Але неўзабаве літ. князі вярнулі яго. Паводле дагавору 1366 паміж Казімірам III і Кейстутам Б. зноў у складзе Вял. кн. Літ. У 1379 разрабаваны і спалены тэўтонскімі рыцарамі, у 1500 — войскамі крымскага хана Менглі-Гірэя. У 13 ст. значны гандлёва-рамесніцкі цэнтр. Як сведчыць польскі гісторык Ян Длугаш, у старажытнасці Б. называлі «прыстанню і варотамі ў літоўскія і рускія землі». Паводле ўстаўной граматы валынскага кн. Мсціслава Данілавіча ад 1289, гараджане Б. плацілі князю падатак грашыма, а сялане — натураю. У 1390 Б. першы з гарадоў Беларусі атрымаў самакіраванне, т. зв. магдэбургскае права, якое пацвярджалася ў 1408, 1511, 1554, 1580, 1607, 1614, 1661. У 1554 зацверджаны герб горада — на чырвоным полі замак у сутоку дзвюх рэк. У 15—16 ст. па багацці і паліт. значэнні Б. займаў адно з першых месц сярод гарадоў Вял. кн. Літ. Прывілеем 1441 афіцыйна ўведзены ў лік гал. гарадоў княства. Праз Б. ішоў гандл. шлях у Польшчу з Слуцка, Пінска, Магілёва, Вільні, а таксама з Масквы. Былі таможня (камора, мытніца), сяляны склад, наладжваліся кірмашы, развіваліся рамёствы. У 1409 у Б. адбылася нарада Ягайлы з Вітаўтам, на якой распрацаваны план паходу супраць Тэўтонскага ордэна. Гараджане выставілі харугву (полк), якая гераічна змагалася ў *Грунвальдскай бітве 1410*. У Б. часта праходзілі сеймы і з'езды бел. і літ. феадалаў (1446, 1454, 1460, 1478, 1505, 1511, 1515, 1518), вайсковыя канфедэрацыі (1605, 1612), сейм Рэчы Паспалітай (1653). З 1413 Б. цэнтр Берасцейскага староства Троіскага ваяводства, а з 1566 — *Брэсцкага ваяводства*, якое з канца 17 ст. ў адрозненне ад Брэст-Куяўскага ў Польшчы стала называцца Брэст-Літоўскім. У 1559 М. Радзівіл (Чорны) заснаваў у Б. друкарню, у якой выдадзена вядомая Брэсцкая біблія (1563). Пасля Люблінскай уніі 1569 Б. у складзе Рэчы Паспалітай. У 1583 адкрыта першая аптэка, у 1588 пачалі брукаваць вуліцы. На Берасцейскім саборы 1596 абвешчана унія зах. праваслаўнай царквы з каталіцкай (гл. *Брэсцкая унія 1596*). *У вызваленчую вайну ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54* жыхары Б. паўсталі супраць польскіх магнатаў (1648). Паўстанне было бласлітасна задушана, горад разбураны. У 1659—66 існаваў *Брэсцкі манетны двор*. У Паўночную вайну 1700—21 Б. займалі то рускія, то шведскія войскі. У 1706 спустошаны войскамі швед. караля Карла XII. У 1792 рэзіденцыя *Таргавіцкай канфедэрацыі*. 8.9.1794 рус. войскі на чале з А. В. Суворавым пад Б. разбілі польскі корпус Ю. Серакоўскага. У 2-й пал. 17—18 ст. Б. прыйшоў у заняпад. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) далучаны да Расіі. З 1796 павятовы цэнтр Слонімскай, з 1797 — Літоўскай, з 1801 — Гродзенскай губ. У 1825 у Б. было каля 11 тыс. ж., 543 жылыя дамы (34 мураваныя), 3 навуч. ўстановы, 3 царквы, 7 манастыроў. У 70-я г. 19 ст. чыгунка і шаша звязалі Б. з Масквой, Варшавай, Адэсай. Б. стаў значным чыг. вузлом і гандл. цэнтрам. Паводле перапісу 1897 у Б. было 46 568 ж., з іх пісьменных 45,5%.

У 1903—04 у Б. створана група РСДРП, якая ў час рэвалюцыі 1905—07 кіравала *Брэсцкімі выступленнямі салдат 1905 і 1906*, забастоўкамі рабочых. 26.8.1915 акупаваны ням. войскамі. З 9(22).12.1917 да 3.3.1918 у Б. адбываліся мірныя перагаворы паміж Сав. Расіяй і Германіяй (гл. *Брэсцкі мір 1918*). У люг. 1919 захоплены бурж. Польшчай. Сав. ўлада ўстаноўлена 1.8.1920. З 19.8.1920 зноў захоплены бурж. Польшчай. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 у складзе Зах. Беларусі адышоў да Польшчы, быў цэнтрам Палескага ваяводства. У 1921—22 у Б. існавала арг-цыя Камуніст. рабочай партыі Польшчы, якая ўзначаліла барацьбу працоўных за сац. і нац. вызваленне. У канцы 1923 у Б. створаны акруговы к-т КПЗБ, у 1924 акруговы і гарадскі к-ты КСМЗБ. З 1927 існавала падпольная друкарня КПЗБ. У студз. 1927 у Б. адбыўся паліт. працэс 31-го, на якім былі засуджаны вядомыя дзеячы КПЗБ В. З. Харужая, З. Ф. Паплаўскі і інш. 15.9.1939 у вы-

ніку нападу фаш. Германіі на Польшчу Б. акупавалі немцы; 22.9.1939 горад вызвалены Чырв. Арміяй. У Вял. Айч. вайну Б. адзін з першых сав. гарадоў (22.6.1941) прыняў на сябе ўдар ням.-фаш. захопнікаў. Цяжкія баі адбываліся на вуліцах і ў крэпасці (гл. *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*). У акупаваным Б. дзейнічалі Брэсцкае партыйнае падполле на чале з *Брэсцкім падпольным абкомам КП(б)Б* і *Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт*. За гады акупацыі гітлераўцы загубілі ў Б. каля 40 тыс. сав. грамадзян, знішчылі ўсе прадпрыемствы, культ.-асветныя ўстановы і палову жыллёвага фонду, прычынілі гораду страты больш як на 45 млн. руб. 28.7.1944 у выніку Люблінска-Брэсцкай аперацыі Б. вызвалены Сав. Арміяй. 47 вайск. часцям, якія вызвалялі горад, прысвоена ганаровае найменне Брэсцкіх. У пасляваенныя гады Б. адбудаваны, пашырыў свае межы.

Гаспадарка. У 1909 у Б. было 53 тыс. ж., 30 прамысл. прадпрыемстваў паўсаматужнага тыпу, з якіх найбольш значныя тытунёвыя ф-кі, млын, гарэлачны з-д. У гады панавання бурж. Польшчы насельніцтва Б. вменшылася да 41 тыс. (1939), прамысловасць яшчэ больш заняпала. Сучасны Б.— буйны прамысл. цэнтр. На яго долю прыпадае каля 1/4 валавой прадукцыі прамысловасці вобласці. Працуюць 32 прадпрыемствы: *Брэсцкі электралямпавы завод*, з-д электравымяральных прылад, *Брэсцкі завод газавай апаратуры* і інш. Развіта тэкст. прамысловасць: *Брэсцкі дывановы камбінат*, *Брэсцкі панчошны камбінат* і суконная ф-ка. Ёсць мэблевая і абутковая ф-кі, мясакамбінат, млын-камбінат, хлебакамбінат, малочны і лікёра-гарэлачны з-ды. Патрэбы буд-ва забяспечваюць з-ды жалезабетонных вырабаў і цэглы. Будуецца (1970) з-д дрэнажных керамічных труб. Значная частка насельніцтва занята на чыг. транспарце і прадпрыемствах, якія абслугоўваюць транспарт. Цераз пагранічную р. Буг пабудаваны мост, які адкрывае шлях на Захад. Пасля Вял. Айч. вайны Брэсцкі чыг. вузел поўнасцю рэканструяваны. На р. Мухавец пабудаваны механізаваны порт. Горад газіфікаваны (паступае дашаўскі прыродны газ). Гарадскі транспарт — аўтобусы.

Ахова здароўя. У Б. на пач. 1969 было 9 бальнічных устаноў на 1533 ложкі (абл. бальніца на 400 ложкаў, чыгуначная на 300, дзіцячая на 150, інфекцыйная на 100, анкалагічны дыспансер на 110 ложкаў, 3 інш. дыспансеры); амбулаторна-паліклінічных устаноў 15; 9 урачэбных і 15 фельч. пунктаў аховы здароўя. Працавалі 503 урачы ўсіх спецыяльнасцей і 1330 чал. сярэдняга мед. персаналу. У 1939 было 3 бальніцы на 340 ложкаў, 3 амбулаторыі. Працавалі 72 урачы (з іх 43 займаліся прыватнай практыкай), 9 фельчароў, 28 акушэрак.


Культура. За гады Сав. улады Б. ператварыўся ў адзін з буйных культ. цэнтраў БССР. У горадзе (на 1.1.1970) 36 дашкольных дзіцячых устаноў (дзяцей 5408); 30 агульнаадук. школ усіх відаў (21 190 вучняў), у т. л. 3 васьмігадовыя, 19 сярэдніх, 7 вячэрніх і пазменных школ рабочай моладзі; муз. школа; 5 прафесійна-тэхн. вучылішчаў (2738 навучэнцаў); 4 сярэднія спец. навуч. ўстановы (будаўнічы і чыгуначнага транспарту тэхнікумы, мед. і муз. вучылішчы; 3045 навучэнцаў); 2 ВНУ: *Брэсцкі педагагічны інстытут*, *Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут*.

Да 1939 у Б. была адна дзяржаўная і 2 прыватныя б-кі. У 1970 працавалі: 53 масавыя б-кі (840 тыс. тамоў), самая вялікая — абл. б-ка імя М. Горкага; 16 клубных устаноў; 13 кінаўстановак; Музей гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці (гл. *Брэсцкай крэпасці-героя музей*) і *Брэсцкі абласны краязнаўчы музей*. У горадзе выходзяць абл. газ. «Заря» і раённая «Заря над Бугом». Абл. радыёвяшчанне (з 1944), абл. студыя тэлебачання (з 1961), абл. аддзяленні Саюза журналістаў БССР, Саюза мастакоў БССР, абл. літаб'яднанне.

Архітэктура, мастацтва. Інтэнсіўнае буд-ва ў Б. пачалося ў 17 ст. (Белы палац, 1620; Інжынернае ўпраўленне, 1679; абодва разбураны ў 1941). У час стварэння ў 1831—42 Брэсцкай крэпасці горад быў перанесены на 3 км на ўсход і пачаў забудоўвацца па рэгулярнай сістэме. У цэнтры Б. (Савецкая вул.) у 2-й пал. 19 ст. ставяцца гандлёвыя і адм. будынкі эклектычнай архітэктуры. Вакол цэнтра ўзнікаюць кварталы асабнякоў мясц. знаці. Асн. забудова Б.— драўляная, дамы сядзібнага тыпу з упрыгожанымі разьбой ліштвамі і карнізамі, своеасаблівымі двухпакатнымі дахамі, накрытымі чарапіцай. У 19 — пач. 20 ст. ў горадзе ствараюцца бульвары і сады, вуліцы абсаджваюцца каштанамі, пірамідальнымі тапалямі, белай акацыяй. У 1921—39 пастаўлена некалькі будынкаў з выкарыстаннем матываў польскага класіцызму (будынак банка, 1930 і інш.). У стылі канструктывізму пабудаваны кірха, 1938; будынак суда, шэраг асабнякоў. Пасля Вял. Айч. вайны Б. забудоўваецца паводле ген. плана (1948, арх. А. Хегай, Л. Фядзенка, Т. Пучкаева), які захоўвае старую прамавугольную планіроўку. Гал. магістралі: вул. Леніна (поўнач — поўдзень), якая звязвае вакзал з набярэжнай р. Мухавец, і вул. Маскоўская (захад — усход), што ідзе ад Брэсцкай крэпасці да Мінскай шашы. Ген. план 1965 (арх. В. Апікін, А. Гарбачоў, Ю. Глінка, Я. Ліневіч) прадугледжвае расшырэнне горада на ўсход, дзе ствараецца комплекс прамысл. прадпрыемстваў і жылы раён, і на поўдзень, дзе будзе жылы мікрараён. У 1957—67 збудаваны комплекс жылых дамоў па вул. Леніна, Набярэжнай, Інтэрнацыянальнай, Маскоўскай і інш. (арх. Гарбачоў, З. Леўчанка, А. Суворай, А. Шкляр, Р. Шыпай), будынкі: вакзала (1954—56, арх. І. Пестрако), гасцініцы «Буг» (1958, арх. Г. Бенядзіктаў), Дома парт. асветы (1963—64, арх. Л. Маскалевіч), універсальнага корпуса інж.-буд. ін-та (1966, арх. Леўчанка), дывановага камбіната (1960—63, арх. Н. Шпігельман, І. Боўт), гал. аб'яднанага прамысл. корпуса заводаў электралямпавага і электравымяральных прылад (1965—68, Боўт, Л. Афанасьева, М. Буйлава і інш.). Добраўпарадкаваны гарадскі парк культуры і адпачынку, набярэжная р. Мухавец, бульвары Гогаля, Міцкевіча, Шаўчэнкі. Помнікі: У. І. Леніну (1959, скульптар П. Ластачкін, арх. Г. Заборскі), Вызвалення Брэста (1965, скульптар М. Альтшулер, арх. Гарбачоў, М. Мілавідаў).

Брэст. Вуліца Маскоўская.





Брэст. Гасцініца «Буг».

Звесткі пра існаванне ў Б. тэатра адносяцца да пач. 18 ст. Пры езуіцкім калегіуме школьны тэатр паставіў дыялогі «Св. Ксаверы», «Св. Антоні Падзеўскі» і інш. У 19 ст. ў Б. гастраліравалі польскія муз.-драм. трупы К. Камінскага, Я. Хелмікоўскага, П. Ратаевіча і інш., рус. трупа А. Ахаліна. У 1921—39 працавалі самадзейныя тэатр. гурткі, якія адыгралі значную ролю ў барацьбе бел. народа за сац. і нац. вызваленне. У 1940 адкрыўся Рус. драм. т-р. Працуюць (1970): *Брэсцкі абласны драматычны тэатр* імя Леніскага камсамола, *Брэсцкі абласны тэатр лялек*. З брэсцкіх музыкантаў чл. Саюза кампазітараў БССР М. Русін, самадзейны кампазітар засл. дзеяч культуры БССР М. Солапаў. Вядомыя самадзейныя калектывы: нар. ансамбль танца «Радасць», нар. т-р і нар. харавая капэла клуба чыгуначнікаў (кіраўнік засл. арт. БССР М. Шошчыц), нар. хор абл. савета прафсаюзаў, нар. хор настаўнікаў, гарадскі сімф. аркестр.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т. 2 — Ипатьевская летопись, М., 1962; Бобровский П. Материалы для географии и статистики России. Гродненская губерния, ч. 2, СПб., 1863, с. 807—851; Щербицкий О. В. Город Брест-Литовский, Вильна, 1913; Mondalski W. Brześć-nad-Bugiem. Zarys geograficzno-historyczny. Rocznik miasta Brześcia-nad-Bugiem, 1930; Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах, т. 1. IX—XVIII ст., Мн., 1936.

М. І. Алексяюк, Т. А. Слесарук (гістарычны нарыс). Брэст; *П. Ф. Лысенка* (археалогія). Мінск; *А. У. Навіцкі* (гаспадарка). Мінск; *В. І. Камейша* (культура), *І. Дз. Белагорцаў* (архітэктура). Брэст; *А. А. Лабовіч* (мастацтва). Мінск.

БРЭСТ-ЛІТОЎСК, гл. *Брэст*.

БРЭСТ-ЛІТОЎСКАЕ ВАЯВОДСТВА, адм.-тэр. адзінка ў Вялікім княстве Літоўскім у канцы 17—18 ст. Гл. *Брэсцкае ваяводства*.

БРЭСЦКАЕ ВАЯВОДСТВА (Берасцейскае), адм.-тэр. адзінка ў *Вялікім княстве Літоўскім*. Утворана ў 1566 у складзе двух узбуйненых паветаў: Брэсцкага і Пінскага. У Брэсцкі пав. увайшлі тэр. Брэсцкага, Камянецкага і Кобрынскага пав. Падляскага ваяводства, у Пінскі — Пінскага, Гарадзецкага і Тураўскага пав. Троекскага ваяводства, Дубровіцкага кн., Бабрэцкай і паўд. часткі Здзітаўскай валасцей Навагрудскага ваяводства. Першы ваявода Ю. Тышкевіч (гл. *Тышкевічы*). У канцы 17 ст. Б. в. ў адрозненне ад Брэсцка-Куяўскага ваяводства Польшчы атрымала назву Брэст-Літоўскае. З нязначнымі зменамі граніц існавала да 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793), калі да Расіі адышоў Пінск. Канчаткова скасавана ў выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795): усх. частка ўз'яднана з Расіяй (увайшла ў склад Слонімскай губерні), а заходняя захоплена Аўстрыяй. *М. І. Алексяюк.* Брэст.


БРЭСЦКАЕ ПАЛЕССЕ, заходняя частка Беларускага Палесся. Размешчана на Пд і ПдЗ Брэсцкай вобл., ад раўніны Загароддзе да берагоў Буга. Пл. каля 5 тыс. км². Рэльеф сфарміраваны ад уздзеяння ледавікоў і іх расталых водаў. Невысокая (140—150 м над узр. м.), плоска-ўвагнутая, аднастайная раўніна. Асобныя шырокія (ад 100 да 200 м) слаба прыўзнятыя пясчаныя грывы і валы зменьваюцца забалочанымі паніжэннямі. Скразныя даліны па раўніне сведчаць пра былы сцёк расталых ледавіковых водаў у Прыпяць, які спыніўся з афармленнем сістэмы рачных далін Буга і Віслы. Месцамі сярод забалочаных масіваў выдзяляюцца агладжаныя марэнныя ўзгоркі (адносныя выш. 5—10 м). Часта трапляюцца перавеяныя градава-бугрыстыя пяскі. Карысныя выкапні: торф, цагельна-чарапічныя гліны і суглінкі. На Пн ад Кобрына выяўлены бурыя вугалі. Ёсць мел (адорвені), баластава-будаўнічыя пяскі. Клімат умераны, вільготны. Сярэдняя т-ра студз. —4,5, ліп. 18,5—19 °С. Ападкаў 550—600 мм за год. Тоўшча снегавога покрыва нязначная. Вегет. перыяд 207—210 дзён. Клімат. ўмовы дазваляюць вырошчваць віноград, абрыкосы, шаўкоўніцу, дыні, гарбузы, каноплі, кукурузу. Рачная сетка належыць да бас. Дняпра і Буга. Самая вялікая р. Мухавец з прытокамі Рыта, Асіпоўка, Трасцяніца. Каналы: Дняпроўска-Бугскі (зах. частка) — суднаходны, Белазерскі, Арэхаўскі, Кобрынскі і інш. выкарыстоўваюцца пры меліярацыі. Найб. азёры: Арэхаўскае, Лукаўскае, Олтушскае, Любань. Глебы пераважаюць дзярнова-падзолістыя, пясчаныя і супясчаныя розныя ступені ападзольвання, шмат тарфяна-балотных нізінных тыпу. На плоскіх грывах, багатых карбанатамі, развіваюцца перагнойна-карбанатныя глебы, якія пераходзяць ніжэй па схілах у аглееныя. У далінах рэк пашыраны алювіяльна-лугавыя, б. ч. забалочаныя. Пад ворывам 30% тэр. Пад лесам каля 25% (бары, хвойна-шыракалістыя лясы, дубова-грабовыя гаі з вязам, чарэшчатым, або летнім, дубам, сядзячакветкавым, або скальным, дубам). Пераважае фаўна зоны мяшаных лясоў. Прамысловыя: ліс, заяц, вавёрка, усурыйскі янот, звычайны хамяк, крот, андатра. *У. У. Сцяцко.* Мінск.

БРЭСЦКАЕ ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, злучэнне партыз. брыгад і атрадаў, якія змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэр. акупаванай Брэсцкай вобл. Створана ў канцы крас. 1943 паводле рашэння *Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б.* Камандзір — сакратар Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б С. І. *Сікорскі* (Сяргей). У штаб па кіраўніцтве злучэннем уваходзілі: П. В. Пранягін (нач. штаба), І. І. *Баброў*, С. Я. Ягораў, Я. М. *Афанасьеў*, Ф. Дз. Рома, А. Н. Драздоў.

Яднала 11 партыз. брыгад: імя Флегантава, № 99 імя Гуляева, імя Панамарэнкі, імя Сталіна, «Савецкая Беларусь», № 150 імя Языковіча, імя Свярдлова, імя Дзяржынскага, № 8, імя Чапаева, імя Леніна; 11 асобна дзейных партыз. атрадаў: «Чэкіст», імя Шчорса, імя Кірава, № 345, імя Будзённага, імя Катоўскага, імя Кутузава, «За Радзіму», № 347, імя Фрунзе, «Сцяг». (Пра партызанскія брыгады і партызанскія асобна дзейныя атрады гл. адпаведныя артыкулы.)

На час злучэння з Сав. Арміяй у Б. п. з. было 12 029 узброеных партызанаў, у т. л. 7210 беларусаў, 2862 рускія, 757 украінцаў, 213 палякаў і інш. У баях загінула каля 2 тыс. байцоў. Партызаны злучэння падарвалі 2126 вайск. эшалонаў ворага, 3 бронепаязды, больш за 26 тыс. рэек, 644 чыг. і машэйныя масты, 82 танкі і танкеткі, 69 бронемашын, 1591 аўтамашыну, разбілі 110 гарнізонаў і штабоў, знішчылі 60 903 і ўзялі ў палон больш за 1 тыс. салдатаў і афіцэраў ворага. У баявым рэзерве злучэння было больш як 6 тыс. чал. *А. А. Фактаровіч.* Мінск.

БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ АБАРОНА 1941, гераічная абарона Брэсцкай крэпасці савецкімі войскамі ў пачатку Вял. Айч. вайны. Брэст апынуўся пад гал. ударам паўд. крыла ням.-фаш. групы армій «Цэнтр». Ням. камандаванне планавала захапіць Брэст в ходу сіламі 31-й, 34-й, 45-й пях. дывізій 12-га армейскага корпуса і 2-й танкавай групы Гудэрыяна. У Брэсцкай крэпасці дыслацыраваліся часці 6-й і 42-й стралк. дывізій 4-й арміі, падраздзяленні пагранічнікаў. На пач. вайны частка падраздзяленняў знаходзілася ў лагерах, на палігонах, на буд-ве ўмацаванага раёна. Раніцай 22 чэрв. палова асабовага складу па баявой трывозе выведзена з крэпасці. На яе тэр. асталося каля 3 тыс. чал. Сілы ворага пераважалі ў 10 разоў. З першых гадзін нападу цяжкія баі вяліся на граніцы, у горадзе і ў крэпасці. Каля тыдня на вакзале абаранялася група байцоў на чале з П. П. Басневым. Гераічна вялі баі лётчыкі 10-й змешанай авіядывізіі. Раніцай 22.6.1941 лётчык С. М. *Гудзімай* тараніў варожы самалёт, у той самы дзень яго подзвіг паўтарыў П. С. *Рабцаў*. Мужна абаранялі байцы 17-га Чырванасцяжнага пагранатрада, 62-га ўмацаванага раёна, байцы Брэсцкага гарнізона. На Цярэспальскім умацаванні абарону ўзначалілі ст. л-ты А. С. Чорны і Ф. М. Мельнікаў. Прарваўшы абарону Цярэспальскага ўмацавання, фашысты ўварваліся ў Цытадэль, захапілі клуб і з тылу пачалі атакаваць раён Холмскіх варотаў, але былі контратакаваны байцамі 84-га стралк. палка на чале з нам. палітрука С. М. Матвасянам. У першы дзень баёў крэпасць была акружана. Да пач. ліпеня абарона мела арганізаваны характар. 24 чэрв. на нарадзе камандзіраў і палітработнікаў у адпаведнасці з «загадам № 1» кіраўнікамі абароны прызначаны капітан І. М. *Зубачоў* і палкавы камісар Я. М. *Фамін*. На Кобрынскім умацаванні абарону ўзначальвалі маёр П. М. *Гаўрылаў*, палітрук С. С. Скрыпнік, капітаны У. В. *Шаблоўскі* і К. Ф. Касаткін, старшы палітрук М. В. Несцярчук, лейтэнант І. П. Акімачкін; на Валынскім умацаванні — батальённы камісар М. С. Багацееў. У Цытадэлі абарону ўзначалілі камуністы: лейтэнанты А. М. *Кіжаватаў*, А. С. Санін, А. А. Вінаградаў, ст. лейтэнанты А. І. Семяненка, А. Я. Патапаў і В. І. Бытко, палітрук П. П. Кашкароў. 29—30 чэрв. гітлераўцы пачалі генеральны штурм крэпасці, ужылі газы, агнямёты. Асн. састаў штаба загінуў, у гарнізоне былі вялікія страты. У пач. ліпеня частка воінаў гарнізона прарвалася з варожага акружэння і дайшла да лініі фронту, частка злучылася з бел. партызанамі. Абаронцы крэпасці — воіны больш за 30 нацыянальнасцей СССР — амаль месяц у цяжкіх умовах блакады адбівалі жорсткія атакі ворага. На сценах казематаў, фортаў і казармаў асталіся іх надпісы: «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!




20.VII.41 г.», «Загінем, але з крэпасці не пойдзем» і інш. Камандзір ням. 45-й пях. дывізіі ген. Шліпер сведчыў: «Рускія ў Брэст-Літоўску змагаліся выключна ўпарта і настойліва. Яны паказалі надзвычайную вывучку пяхоты і даказалі выдатную волю да перамогі...»

Многія ўдзельнікі абароны ўзнаг. ордэнамі і медалямі. Лейтэнанту Кіжаватаву і маёру Гаўрылаву прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 8.5.1965 крэпасці прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-герой» з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». У крэпасці створаны музей абароны (гл. *Брэсцкай крэпасці-героя музей*), будуецца мемарыяльны комплекс. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці стала крыніцай натхнення і тэмай твораў выяўленчага мастацтва (карціны І. В. Ахрэмчыка, Я. А. Зайцава, П. А. Крываногава), драматургіі (п'есы «Брэсцкая крэпасць» К. Л. Губарэвіча, «Крэпасць над Бугам» С. С. Смірнова), музыкі (опера К. У. Малчанава), кінематаграфіі («Бессмяротны гарнізон»).

Літ.: Смирнов С. С. Герои Брестской крепости, М., 1961; его же. Брэсцкая крэпасць, пер. з рус., Мн., 1967; Героическая оборона, 3 изд., Мн., 1966. *Т. М. Ходуева.* Брэст.

БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ-ГЕРОЯ МУЗЕЙ (Музей абароны Брэсцкай крэпасці-героя). Адкрыты 8.11.1956 на базе гарнізоннага пакоя-музея. У фондах і 10 экспазіцыйных залах (пл. 1808 м²) больш за 20 тыс. экспанатаў. Аддзелы: гісторыя Брэста і Брэсцкай крэпасці; вераломны напад фаш. Германіі на СССР, баі на граніцы і *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*; удзел абаронцаў крэпасці ў Вял. Айч. вайне 1941—45; ветэраны вайны — актыўныя будаўнікі камунізма; Сав. Армія на варце міру і бяспекі. Сярод экспанатаў баявыя сцягі, пад якімі рус. войскі на чале з А. В. Суворавым перамаглі польскія войскі ў баях пад Брэстам; зброя 18 — пач. 19 ст.; медалі ў гонар перамог Расіі над Напалеонам; макет і сімвалічны ключ крэпасці 19 ст. Галоўнае ў экспазіцыі — масавы гераізм і стойкасць абаронцаў крэпасці ў першы месяц Вял. Айч. вайны: баявыя сцягі, зброя, дакументы, рэчы, выяўленыя ў час раскопак на тэр. крэпасці, у т. л. «Загад № 1» па гарнізоне крэпасці ад 24.6.1941, сцяг

Надпіс абаронцаў Брэсцкай крэпасці на сцяне каземата.






Гітлераўцы прачэсваюць руіны крэпасці.


393-га Асобнага зенітнаартыл. дывізіёна, сцяг, уручаны Выканкомам Камінтэрна 84-у стралк. палку; абгарэлы партбілет невядомага воіна і камсамольскі білет лейтэнанта А. Ф. Наганава, а таксама трафейныя дакументы, фотаздымкі, зробленыя гітлераўцамі ў час баёў за крэпасць. Сярод экспанатаў адозвы, выдадзеныя ў тыле ворага; зброя, зробленая ў партыз. майстэрнях; матэрыялы пра кіраўнікоў партыз. руху і камуніст. падполля на Брэстчыне. Спец. стэнды расказваюць пра абаронцаў граніцы і крэпасці, якія гераічна змагаліся на франтах Вял. Айч. вайны, у партыз. атрадах,— Герояў Сав. Саюза С. П. Пазнякова, М. А. Кузняцова, М. І. Мяснікова; камандзіра партыз. атрада Р. М. Гудыму; удзельнікаў Руху Супраціўлення амаль ва ўсіх краінах Еўропы — П. І. Лаенкава, А. І. Каструліна, Д. А. Абдулаева і інш.; *Люблінска-Брэсцкую аперацыю 1944;* вайсковыя злучэнні і воінаў, якія вызначыліся ў баях на Брэстчыне. Асобны стэнд прысвечаны дзейнасці Дз. М. *Карбышава*. Багата твораў жывапісу і скульптуры. У асобнай зале рэлікві і падарункі ў сувязі з прысваеннем крэпасці ганаровага наймення «Крэпасць-герой»; кнігі, артыкулы, вершы, песні. Тут наладжваюць злёты камсамольцаў і піянераў, уручаюць камсамольскія білеты. З удзелам супрацоўнікаў музея выдадзены аб. ўспамінаў: «Гераічная абарона», «Буг у агні»; даведнік па мясцінах баёў «Брэсцкая крэпасць», фотаальбом «Брэсцкая крэпасць-герой», бібліягр. даведнік «Крэпасць-герой», альбом «Крэпасць-герой» і інш. У 1969 музей наведала больш за 400 тыс. чал.; з дня адкрыцця — больш за 4 млн. чал., у т. л. дэлегацыі з 97 краін свету. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Брэсцкая крэпасць.*

Літ.: Брестская крепость. Путеводитель по местам боев, 7 изд., М., 1967. *М. І. Гялзер.* Брэст.

БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, абласная арганізацыя Кампартыі Беларусі. Першыя рэвалюц. т-вы і с.-д. гуркі на тэр. Брэсцкай вобл. ўзніклі ў 90-я г. 19 ст. У 1897 у Брэсце існавала тайнае т-ва рабочых і рамеснікаў. Пад уздзеяннем «Искры» і бальшавіцкіх ідэй II з'езду РСДРП ві-


мою 1903—04 аформіліся *Брэсцкая арганізацыя РСДРП* і *Пінская арганізацыя РСДРП*, якія падтрымлівалі сувязь з *Паўночна-Заходнім камітэтам РСДРП*. Першыя рэвалюц. выступленні рабочых адбыліся ў 1897 у Брэсце, у 1898 і 1901 у Пінску. У перыяд рэвалюцыі 1905—07 пад кіраўніцтвам арг-цый РСДРП бурныя выступленні праходзілі ў многіх населеных пунктах вобласці. У Пінску баставалі рабочыя гал. майстэрняў палескіх чыгунак, фанернай і шпілечнай ф-к, гарбары; у Брэсце — рабочыя гільзавых і канвертных ф-к, друкары, рамеснікі, паштова-тэлеграфныя служачыя; у Целяханах — рабочыя гуты; у Пружанах — тытунёвай ф-кі; у Ружанах — ткачы і фарбавальшчыкі суконных ф-к і інш. У час Усерасійскай кастр. паліт. стачкі Брэст аб'яўлены на ваен. становішчы, у Баранавічах, Лунінцы, Пінску дзейнічалі створаныя бальшавікамі стачачныя к-ты. Рабочыя Брэстчыны актыўна падтрымалі Снежаньскае ўзброенае паўстанне ў Маскве (гл. *Баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905, Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906, Пінскае выступленне рабочых 1905*). Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі сяляне Брэстчыны захоплівалі памешчыцкую зямлю, сенажаці. У снеж. 1905 у Пружанскім і Кобрынскім пав. уведзена становішча ўзмоцненай аховы (да канца 1907). Нягледзячы на цяжкія страты, члены РСДРП Брэстчыны і ў гады рэакцыі ўмацоўвалі сувязь з масамі. У канцы 1908 аднавіла дзейнасць Брэсцкая, у студз. 1909 Пінская арг-цыі РСДРП. У гады новага рэвалюц. ўздыму барацьба працоўных узмацнілася. Рабочыя Пінска баставалі ў студз. і снеж. 1910, сак. 1913. Сяляне в. Чарневічы (лют. 1910), Дзераўное (кастр. 1911) Пінскага пав. спалілі маёнткі памешчыкаў; у маі 1912 адбылася ўзброеная сутычка сялян в. Бродніца і Вулька з памешчыкамі з-за сервітутаў. У 1-ю сусв. вайну большасць паветаў Брэстчыны акупавана ням. войскамі, умовы дзейнасці парт. арг-цый ускладніліся. У 1915 у Лунінцы створана падпольная арг-цыя бальшавікоў на чале з І. Е. *Любімавым*. У 1916 у Лунінец і інш. неакупаваныя населеныя пункты для разгортвання парт. работы сярод салдатаў прыязджаў М. В. Фрунзе. Сав. ўлада на неакупаванай тэр. Брэстчыны ўстаноўлена ў ліст. 1917. У Лунінцы 11—12(24—25).11.1917 адбыўся 1-ы з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэп. Пінскага пав., старшынёй якога выбраны бальшавік А. І. Таганаў. Актывізавалі дзейнасць падпольныя партарганізацыі ў акупаваных Пінску, Баранавічах, якія наладзілі сувязь з ЦК РКП(б) і Паўн.-Зах. абл. к-там РКП(б). У канцы 1918 у Пінску, Століне, Лунінцы і Давыд-Гарадку ўзніклі падпольныя рэўкомы. Барацьбой супраць акупантаў кіравала група бальшавікоў на чале з упаўнаважаным ЦК РКП(б) А. М. *Ільіным*. Пасля выгнання ням. акупантаў ва ўсх. паветах Брэстчыны ўстаноўлена Сав. ўлада. На тэр. Брэстчыны, захопленай Польшчай зімой 1919, падпольна дзейнічалі арг-цыі і групы КП(б)ЛіБ, якія ўздымалі працоўных на барацьбу з акупантамі. Летам 1920 Брэстчына вызвалена Чырв. Арміяй, створана 5 пав. рэўкомаў: Баранавіцкі, Брэсцкі, Кобрынскі, Пінскі, Пружанскі. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 Брэстчына аставалася пад Польшчай. Да 1923 рэвалюц. дзейнасць у Зах. Беларусі ўзначальвалі падпольныя арг-цыі Камуніст. рабочай партыі Польшчы (КПРП). Яны існавалі ў Брэсце, Высока-Літоўску, Кобрыне, Пінску, Пружанах, Бярозе-Картузскай, Шарашове і інш. Кіраваў імі Брэсцкі падпольны акр. к-т КПРП на чале з С. А. *Дубовікам*. Пасля стварэння ў кастр. 1923 *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі* на тэр. Палескага ваяводства дзейнічалі 3 акруговыя (Слонімска-Баранавіцкі, Брэсцкі, Пінскі) і 43 раённыя і падраённыя к-ты КПЗБ, якія ўзначальвалі барацьбу працоўных за сац. і нац. вызваленне. Партыз. рухам кіравалі камуністы К. П. *Арлоўскі*, С. А. *Вайпшасаў*, В. З. *Корж*, І. Г. Раманчук, І. Мельнічук, П. Шарамета, І. Цапко і інш. Пад кіраўніцтвам КПЗБ падпольную работу вялі 3 акр. і каля 40 раённых і падраённых к-таў КСМЗБ, а таксама гурткі нац.-вызв. арг-цыі *Беларускай сялянска-рабочай грамады*. Значныя выступленні працоўных Брэстчыны, якія падрыхтавала і ўзначальвала КПЗБ: Косаўская дэманстрацыя (гл. *Косаўскі расстрэл 1927*), забастоўка лясных рабочых Белавежскай і Ружанскай пушчаў 1932—34, *Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян 1933*. Актыўнымі дзеячамі КПЗБ на Брэстчыне былі Р. Д. *Вольф* (Алена), П. Ф. Дзмітрук, С. А. Дубовік, М. Е. *Крыштафовіч*, С. С. *Панкова*, З. Ф. *Паплаўскі*, С. П. Пацяруха, В. С. Селівонік, І. П. *Урбановіч*, А. І. *Федасюк*, У. З. *Царук*; КСМЗБ: С. Я. *Багданчук*, М. М. *Дворнікаў*, В. З. *Харужая*, А. А. *Альшэўскі*, Н. І. Андраюк, С. Р. *Анісаў*, М. П. *Маслоўскі*, В. П. Ласковіч і інш. Для расправы з рэвалюцыянерамі прафашысцкі ўрад Пілсудскага стварыў *Бярова-Картузскі канцэнтрацыйны лагер*. У 1938 КПП, а таксама КПЗБ рашэннем Выканкома Камінтэрна распушчаны, але камуністы не спынялі рэвалюц. барацьбы. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР на тэр. Брэсцкай вобл. паводле адм. падзелу ў снеж. 1939 створаны 3 вобласці, парт. работу ў якіх вялі Брэсцкі, Пінскі і Баранавіцкі абкомы КП(б)Б. Брэсцкі абком КП(б)Б узначальваў 18 раённых і Брэсцкую гарадскую партарганізацыі. На 15.12.1939 парт. арг-цыя Брэсцкай вобл. налічвала 273, на 1.6.1941 — 2932 камуністы. Пад яе кіраўніцтвам ажыццяўляліся карэнныя сацыяліст. пераўтварэнні. З першых дзён Вял. Айч. вайны камуністы Брэстчыны самаадданa змагаліся і ўздымалі працоўных на барацьбу з ворагам. Камуністы ўзначальвалі *Брэсцкай крэпасці абарону 1941*. У Пінску арганізаваны адзін з першых на Беларусі партыз. атрад (23.6.1941). У 1942 створаны *Пінскі падпольны абком КП(б)Б* (сакратары А. Я. *Кляшчоў*, С. Р. *Вайцаховіч*), у пач. 1943 *Баранавіцкі падпольны абком КП(б)В* (сакратары В. Я. *Чарнышоў*, Ф. А. Ба-







1




2

Брэст.

1. Асада Брэста шведамі ў 1657. Фрагмент гравюры.
2. Вакзал.
3. Будынак аблвыканкома на плошчы Леніна.
4. Набярэжная ракі Мухавец.
5. Інжынерна-будаўнічы інстытут.
6. Помнік у гонар вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.
7. Дывановы камбінат.



3




4



5



6





7



1



2


3


4



5


6


7

Брэсцкая вобласць.

1. Рака Мухавец каля Брэста.
2. У Белавежскай пушчы.
3. Ваколіцы Брэсцкай крэпасці.
4. Пінск. Заходні мікрараён.
5. Уборка і прасаванне сена ў калгасе імя Жданава Брэсцкага раёна.
6. Брэсцкі рачны порт.
7. Выступленне брэсцкага гарадскога народнага ансамбля танца «Радасць» на плошчы імя У. І. Леніна ў Брэсце.
8. У ткацкім цэху Баранавіцкага баваўнянага камбіната.


8

ранаў), *Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б* (сакратары С. І. *Сікорскі*, І. І. *Баброў*); 28 падпольных райкомаў і гаркомаў. На тэр. вобласці дзейнічалі *Брэсцкае партызанскае злучэнне*, *Пінскае партызанскае злучэнне* і часткова *Баранавіцкае партызанскае злучэнне*. Пад кіраўніцтвам падпольных парт. арг-цый барацьбу з ням.-фаш. захопнікамі вялі камсамольскае падполле на чале з Брэсцкім, Баранавіцкім і Пінскім падпольнымі абкомамі ЛКСМБ, антыфаш. патрыятычнае падполле, якое ўзначальвалі *Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт* і *Баранавіцкі акруговы антыфашысцкі камітэт*. Выдаваліся абл. газеты «Заря» — орган Брэсцкага, «Чырвоная звязда» — Баранавіцкага, «Палеская праўда» — Пінскага падпольных абкомаў КП(б)Б; «Молодой мститель» — орган Баранавіцкага падпольнага абкома ЛКСМБ, «За Родину» — орган Брэсцкага абл. антыфаш. к-та, гарадская і 16 раённых газет. Пасля вызвалення Брэстчыны ад ням.-фаш. захопнікаў (ліп. 1944) парт. арг-цыі ўзначалілі барацьбу працоўных за аднаўленне і развіццё нар. гаспадаркі. У парт. арг-цыі Брэсцкай вобл. на 1.9.1944 быў 1341 камуніст. У выніку росту парт. арг-цый і ўзбуйнення Брэсцкай вобл. (далучаны Пінская і 4 р-ны Баранавіцкай вобл.) на 1.1.1954 у ёй было 1412 пярвічных арг-цый, якія ядналі 14 740 чл. КПСС. Паводле рашэння ліст. Пленума ЦК КПСС 1962 Б. а. п. а. з студз. 1963 да снеж. 1964 падзялялася на сельскую і прамысл. парт. арг-цыі (адпаведна ўтвораны сельскі і прамысл. абкомы). На 1.1.1970 Б. а. п. а. налічвала 44 338 чл. і канд. у чл. КПСС, 16 райкомаў, 3 гаркомы, 1618 пярвічных парт. арг-цый. Друкаваны орган Брэсцкага абкома КПБ і выканкома абл. Савета дэп. працоўных газ. «Заря». У вобл. выдаецца 14 раённых, 2 аб'яднаныя і 1 шматтыражная газета. Першымі сакратарамі Брэсцкага абкома КПБ працавалі М. В. Кіслёў (ліст. 1939 — жн. 1940), М. М. Тупіцын (жн. 1940 — чэрв. 1941, кастр. 1943 — кастр. 1946), С. І. Сікорскі (падпольны абком, сак. 1943 — ліп. 1944), В. Я. Чарнышоў (кастр. 1946 — снеж. 1948), Ф. П. Сіляеў (снеж. 1948 — вер. 1952), Ц. Я. Кіслёў (вер. 1952 — жн. 1955), П. М. Машэраў (жн. 1955 — крас. 1959), А. А. Смірноў (крас. 1959 — снеж. 1962), Л. П. Мятліцкі (студз. 1963 — снеж. 1964 першы сакратар прамысл. абкома); з снеж. 1962 У. А. Мікуліч (з студз. 1963 — першы сакратар сельскага абкома, з снеж. 1964 — першы сакратар абкома). Абл. партыйныя канферэнцыі адбываліся: I — 18—20.4.1940, II — 7—9.10.1946, III — 29—30.1.1949, IV — 7—8.4.1951, V — 3—4.9.1952, VI — 1.2.1954, VII — 19—20.12.1955, VIII — 7—8.2.1958, IX — 9.1.1959, X — 11.1.1960, XI — 7—8.9.1961, XII — 10.12.1964, XIII — 8.2.1966, XIV — 21.2.1968. Верным памочнікам парт. арганізацыі ў вырашэнні задач камуніст. буд-ва з'яўляецца камсамольская арг-цыя вобласці, якая на 1.1.1970 налічвала 125 043 чл. ЛКСМБ, аб'яднаных у 2358 пярвічных арг-цый.

Кр.: Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.), т. 3, Мн., 1953; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907. Документы и материалы, Мн., 1955; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929 гг.), Мн., 1962.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, ч. 2 (1921—1966), Мн., 1967; Вальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.), Мн., 1966; Рашевский Н. Белорусская ССР. Брестская область, Мн., 1968.

Б. І. Камейша. Брэст.

БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ ДОСЛЕДНАЯ СТАНЦЫЯ, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя пытанні агратэхнікі і заатэхніі. Арганізавана ў 1956 у г. Пружаны Брэсцкай вобл. на базе саўгаса «Белавусаўшчына». Дырэктар канд. с.-г. н. У. Я. Талашкевіч (з 1969). Мае 10 аддзелаў; 2 эксперымент. базы — «Белавусаўшчына» ў Пружанскім р-не і «Вольна-Чэрніхава» ў Баранавіцкім р-не. Асн. праблематыка даследаванняў: распрацоўка агратэхн. і заатэхн. прыёмаў забеспячэння найбольшага выхаду с.-г. прадукцыі на адзінку зямельнай плошчы пры найменшых затратах працы і сродкаў на яе вытворчасць; вывядзенне новых і ўдасканаленне наяўных сартоў бульбы, бабовых і інш. с.-г. культур; абагульненне перадавога вопыту і ўкараненне дасягненняў навукі ў вытворчасць. На станцыі выведзены высокаўраджайныя сарты фасолі Мотальская белая, гароху Якавіцкі і Юбілейны. На эксперымент. базах праводзіцца першаснае насенняводства па збожжавых, зернебабовых культурах і бульбе. С.-г. станцыя забяспечвае калгасы і саўгасы Брэсцкай вобл. гатунковым насеннем збожжавых, крупяных культур і бульбы.

БРЭСЦКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП (Брэст-Літоўская арганізацыя РСДРП). Першы с.-д. гурток у Брэсце ўзнік у 2-й пал. 90-х г. 19 ст. У горадзе існавала тайнае т-ва рабочых і рамеснікаў. У 1897 па справе т-ва арыштавана 17 чал. Зімой 1903—04 з прыхільнікаў ленінскай «Искры» ўзнікла Б. а. РСДРП (кіраўнік Г. А. Клевер), звязаная з *Паўночна-Заходнім камітэтам РСДРП*. Яна вяла рэвалюц. прапаганду, распаўсюджвала марксісцкую л-ру, пракламацыі. У 1904 арганізавала першамайскую дэманстрацыю, якая закончылася сутычкай з паліцыяй. 18.1.1905 правяла стачку друкароў і рамеснікаў горада ў знак пратэсту супраць расстрэлу 9.1.1905 у Пецярбурзе. Першамайская дэманстрацыя 1905 праходзіла пад заклікамі «Далоў царскае самадзяржаўе!», «Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка!» і вылілася ва ўсеагульную забастоўку рабочых горада. У перыяд Усерасійскай кастр. паліт. стачкі 1905 Б. а. РСДРП узначаліла забастоўку чыгуначнікаў і тэлеграфістаў горада, арганізавала дэманстрацыю і мітынг, на якіх бальшавікі выкрывалі ліжывы характар царскага маніфеста. 20.10.1905 горад аб'яўлены на ва-

енным становішчы, пачаліся арышты, спыніліся заняткі ў гімназіях. 14—15.11.1905 вноў праходзілі мітынгі рабочых, на якіх сярод прамоўцаў былі і прадстаўнікі Мінскай групы РСДРП. У ліст. баставалі паштова-тэлеграфныя служачыя. У знак салідарнасці з пралетарыятам Масквы ў снеж. 1905 Б. а. РСДРП выпусціла адозву «Да ўсіх грамадзян горада Брэста» з заклікам да ўзброенага паўстання. Прадстаўнік Брэст-Літоўскай групы РСДРП з дарадчым голасам прысутнічаў на з'ездзе *Паўночна-Заходняга саюза РСДРП* у маі 1906. У чэрв. 1906 пад кіраўніцтвам Б. а. РСДРП баставалі друкары горада, патрабуючы скарачэння рабочага дня на 1 *гадз*, і дамагліся свайго; у ліп. адбылася забастоўка салідарнасці з паўстаннем маракоў Свеаборга і Кранштата. Б. а. РСДРП вяла паліт. работу і сярод сялян павета. У пач. чэрв. 1905 сяляне в. Старынцы, Эймінаўцы, Карпаўцы самавольна пасвілі жывёлу на памешчыцкіх угоддзях; у маёнтках памешчыкаў Замойскага, Паніквіцкага, Гутоўскага захапілі ворную зямлю, сенажаць, лес. У в. Вяльямавічы, Мінкавічы, Ставы, Хоціна ўлады пасылалі войскі. У кастр. 1905 адбыліся забастоўкі с.-г. рабочых Брэсцкага пав., якія ахапілі маёнткі Цяляцічы, Мілейчыцы, Нурэц, Сасіны, Літвінавічы і інш. Б. а. РСДРП выпусціла праклямацыю, у якой выкладзены патрабаванні с.-г. рабочых в. Ямна да памешчыка. У ліп. 1906 адбылася крывавая сутычка сялян в. Бордзеўка з салдатамі: 9 сялян забіта, 4 паранена. Каб узмацніць паліт. работу сярод салдатаў, Б. а. РСДРП стварыла *Брэсцкую ваенна-рэвалюцыйную арганізацыю РСДРП*, разам з якой падрыхтавала і правяла *Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906*. У Брэсце 21.9.1906 пачаліся новыя масавыя арышты. Арыштаваны і Клевер. Чл. Б. а. РСДРП, якія ўцалелі, не спынялі рэвалюц. работы. У канцы 1908 Б. а. РСДРП адноўлена. Яе прадстаўнікі ўдзельнічалі ў парадзе бальшавікоў Вільні, Гродна, Брэста, Вілейкі для абмеркавання парт. работы ва ўмовах сталыпінскай рэакцыі. З 1912 у Брэсце існавала праўдзісцкая група, рабочыя пасылалі сродкі ў фонд «Правды». Летам 1914 Б. а. РСДРП разгромлена. У 1-ю сусв. вайну Брэст акупавалі нямецкія войскі. У горадзе існавала падпольная камуніст. арг-цыя. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 Брэст адышоў да Польшчы, рэвалюц. работу ўзначаліла Камуніст. рабочая партыя Польшчы (КПРП), а з кастр. 1923 *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі* (КПЗБ).

Літ.: Гл. пры арт. *Брэсцкая абласная партыйная арганізацыя.* *М. М. Слепакова.* Брэст.

БРЭСЦКАЯ ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП, створана бальшавікамі пры *Брэсцкай арганізацыі РСДРП* для рэвалюц. работы ў войску. Існавала з канца 1905 да кастр. 1906. Дзейнічала пад кіраўніцтвам *Ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі пры Абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі.* Кіраўнік — рабочы І. І. Зінаўчук, члены: салдаты М. Н. Какавіхін, Анісімаў; пісары: Аляксандраў, Гарохаў, урач Іваноў. Распаўсюджвала сярод салдатаў бальшавіцкую л-ру, вяла рэвалюц. прапаганду і агітацыю. Выдала адозвы «Да салдатаў Брэст-Літоўскай крэпасці» (лета 1905), «Да ўсіх салдатаў Брэст-Літоўскай крэпасці і гарнізона» (21.11.1905), у якіх заклікала іх выступаць супраць царызму, браць прыклад з матросаў Кранштата і Севастопаля, з салдатаў Харкава і Гродна і пераходзіць на бок рэвалюц. рабочых. Удзельнічала ў падрыхтоўцы і правядзенні *Брэсцкіх выступленняў салдат 1905 і 1906.* Паліцыя 23.9.1906 выкрыла Б. в.-р. а. РСДРП. Пры вобыску знойдзены рэвалюц. л-ра, пячатка, сшытак з запісамі збору сродкаў і прозвішчамі членаў, багатая перапіска. Зінаўчуку ўдалося ўцячы. 6.10.1906 па справе Б. в.-р. а. РСДРП пачалося следства, якое цягнулася да 1908. *М. М. Слепакова.* Брэст.

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Беларускай ССР. Утворана 4.12.1939. Размешчана на ПдЗ рэспублікі, каля граніцы СССР з Польшчай. Пл. 32,3 тыс. *км²*, нас. 1295 тыс. чал. (1970). У вобл. 16 раёнаў: Баранавіцкі, Брэсцкі, Бярозаўскі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Жабінкаўскі, Іванаўскі, Івацэвіцкі, Камянецкі, Кобрынскі, Лунінецкі, Ляхавіцкі, Маларыцкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі (гл. адпаведныя артыкулы), 14 гарадоў; 12 гар. пас., 3 рабочыя пасёлкі. Цэнтр г. Брэст. (Карты і іл. гл. на ўкл.)

Прырода. Рэльеф раўнінны, пераважае нізінны, 140—200 *м* над узр. м. Паўд.-зах. частку вобласці займае нізіна Брэсцкае Палессе, усх. частку — Прыпяцкае Палессе. Між імі — платопадобная раўніна Загароддзе і Дняпроўска-Бугскі водападзел. Зах. частку займае слабахвалістая Прыбугская раўніна, паўночную — Баранавіцкая раўніна і частка Навагрудскага ўзв. (найвыш. пункт вобласці 267 *м* над узр. м.). З карысных выкапняў найбольшае значэнне мае торф, запасы торфу-сыравіны 5986 млн. *м³* (20% агульнарэспубліканскіх). Найбольшыя паклады ў раёне групы Спораўскіх азёраў, на крайнім У і ў Пінскім р-не. Найважнейшыя радовішчы буд. м.: тугаплаўкія гліны каля ст. Гарынь, мел каля Бярозы, цагельныя гліны каля Брэста і Кобрына. Ёсць буры вугаль, нафта, балотная руда. Клімат умерана вільготны з мяккай кароткай зімой і ўмеранай цёплым доўгім летам. Сярэдняя месячная т-ра студз. —4 на З, —6 °С на У. ліп. 18—19 °С. Вегет. перыяд 195—210 дзён. Ападкаў за год 650 *мм* на ПнУ, 550 *мм* на ПдЗ; у цёплы перыяд 400—450 *мм*. 50% тэр. вобласці адносіцца да бас. Прыпяці, 35 да Буга, 15% да Нёмана. Агульная даўж. рэк 5 тыс. *км*. Найбольшыя рэкі: Прыпяць з прытокамі Ясельда, Бобрык, Цна, Лань, Случ, Піна (злева), Стыр, Гарынь, Сцвіга (справа); Шчара (прытокі Мышанка і Грыўда) упадае ў Нёман; Мухавец і Лясная — у пагранічную раку Буг. На тэр. вобласці Дняпроўска-Бугскі канал. З азёраў (усяго каля 50) найб. вядомыя Выганаўскае, Чорнае, Спораўскае, Бабровіцкае, Пагост, Белае, Арэхаўскае, Лукаўскае. Азёры пераважна мелкаводныя, багатыя на рыбу. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (24%), дзярнова-падзолістыя забалочальныя (27%), дзярнова-балотныя (13%), тарфяна-балотныя (26%) і алювіяльныя (каля 10%). З мінер. глебаў сугліністых 11%, супясчаных 62, пясчаных 27%. Найб. урадлівыя глебы на суглінках і супесках, якія падсцілаюцца марэнай, яны займаюць паўн. частку вобласці і Загароддзе. Тарфяна-балотных глебаў, пераважна нізінных (тыс. *га*) 629,9, з іх 275,6 асушана, у т. л. 258,9 пад ворывам і пашай. Усяго на канец 1969 асушана 359,8 тыс. *га* забалочаных зямель. Каля паловы ворных зямель і 25% сенажацяў патрабуюць вапнавання. Амаль $^2/_3$ тэр. вобл. ўваходзіць у падзону шыракаліста-хваёвых лясоў, на Пн ад яе — падзона грабова-дубова-цёмнахвойных лясоў. Лясістасць 35%. Найбольш лясоў у Лунінецкім, Ганцавіцкім і Івацэвіцкім р-нах (лясістасць 41—50%), найбяднейшыя лясамі Пінскі, Драгічынскі, Кобрынскі, Жабінкаўскі р-ны (лясістасць 11—20%). На ПнЗ вобл. Белавежская пушча, лясы якой выключаны з гасп. карыстання. Балоты займаюць 20,2% тэр., з іх нізінных 89,1, пераходных 6,1, вярховых 4,8%. Пад лугамі і пашай 624,5 тыс. *га*, з іх 4% — лугі-пустошы, 4% — звычайныя сухадольныя бабовалакавыя разнатраўныя. З пераўвільготненых сухадольных лугоў 8% — разнатраўна-злакавыя з белавусам і кусцікамі і 12% — злакава-разнатраўныя з дробнымі асокамі. Балотныя лугі на дзярнова-глеевых глебах (злакава-дробнаасаковыя) займаюць 14%, на тарфяных глебах (асаковыя) 33%. Заліўныя лугоў у абалонах рэк 157,5 тыс. *га*, з іх 80% асаковыя і дробнаасаковыя. Жывёльны свет найб. абярогся ў Белавежскай пушчы: зубры, высакародныя алені, казулі, барсукі, дзікі і інш.

Насельніцтва. Паводле перапісу 1959 у вобласці жывуць: беларусы (86%), рускія (7,4%), палякі (3,5%), украінцы (2,2%), яўрэі (0,5%) і інш. Гарадскога нас. 35%. Сярэдняя шчыльнасць 40,1 чал. на 1 *км²*. Найб. густа населены Бярозаўскі (43,1 чал. на 1 *км²*), Іванаўскі (42,2), Ляхавіцкі (33,6) раёны. Меншая шчыльнасць насельніцтва ў Ганцавіцкім (20,4), Маларыцкім (22,6), Івацэвіцкім (24,5) раёнах. Найб. гарады (тыс. чал., 1970): Брэст (122), Баранавічы (102), Пінск (62), Кобрын (25), Лунінец (10,9), Пружаны (10).

Гістарычны нарыс. Засяленне тэр. Б. в. чалавекам пачалося ў час позняга палеаліту па Зах. Бугу, Стыры, Гарыні і на Пн ад іх. Найб. стараж. стаянкі і паселішчы — Лосінцы, *Опаль* і інш. — належаць да *свідэрскай культуры.* Поўнасцю заселена тэр. вобласці ў эпоху мезаліту, пра што сведчаць 19 помнікаў, пераважна макралітычнага тыпу, падобных да паўн.-валынскіх, панямонскіх помнікаў і да сталінак бас. Віслы. У 4-м тысячагоддзі да н. э. на У жылі плямёны культуры грабеньчатай керамікі *(Бахінічы, Камень,* Спораў, Церабень і інш.). У 2-й пал. 3-га тысячагоддзя да н. э. з З прыйшлі плямёны культуры лейкападобных кубкаў, а на ПнУ — *нёманскай культуры.* З пач. 2-га тысячагоддзя да н. э. пашырылася палеская група плямёнаў *шнуравой керамікі культуры.* У выніку ўзаемадзеяння абарыгеннага насельніцтва з прышэльцамі і зліцця культур у сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. ўзнікла *тшцінецкая культура*; пранікалі элементы культуры шарападобных амфар, пазней — *лужыцкай культуры.* У жалезным веку амаль на ўсёй тэр. Б. в. жылі плямёны *зарубінецкай культуры* (*Атвержычы, Велямічы, Рубель* і інш.), якія на У змяніліся плямёнамі *мілаградскай культуры* (6—5 ст. да н. э.), на З — *паморскай культуры.* У сярэдзіне 6 ст. на Пд ад Ясельды і Прыпяці з'явіліся славянскія (магчыма, дулебскія) плямёны, якія пакінулі помнікі пражскага тыпу. Верагоднае існаванне праславянскіх плямёнаў і ў больш раннія часы (мілаградскай і зарубінецкай культур). Мяркуюць, што тэр. вобласці часткова ўваходзіла ў склад слав. прарадзімы або межавала з ёю і была раёнам першай міграцыі славян. У 2-й пал. 1-га тысячагоддзя ў бас. Буга жылі *бужане* і *валыняне*, на Пн вобласці — *дрыгавічы*, на Пд ад Прыпяці — *драўляне.* З 9 ст. тэр. Б. в. ў складзе старажытнарускай дзяржавы — Кіеўскай Русі. Да сярэдзіны 12 ст. тэр. Б. в. ў складзе *Тураўскага княства*, з якога выдзеліліся Пінскае, Давыд-Гарадоцкае, Дубровіцкае княствы. У 12 ст. *Берасцейская зямля* адышла да Уладзіміра-Валынскага княства, паўн. частка тэр. Б. в. — да Слонімскага і Клецкага княстваў. З канца 13 — 1-й пал. 14 ст. тэр. вобласці ў складзе Вял. кн. Літоўскага. З 1413 амаль уся яна ўваходзіла ў Троекае ваяводства, з 1520 зах. частка — у Падлясае, а паўн.-ўсх. — у Навагрудскае ваяводствы. У 1566 утворана Берасцейскае ваяводства, якое ўключала амаль усю тэр. вобласці. Найб. гарады Брэсце (1019), Пінск (1097), Камянец (1276). У 14—17 ст. многія гарады Брэстчыны атрымалі магдэбургскае права: Брэсце (Брэст) — 1390, Камянец — пач. 16 ст., Пінск — 1561, Кобрын — 1588, Пружаны — 1588, Дзівін — 1642, Мальч — 1645, Гародна (Гарадзея) — 1670 і інш. Насельніцтва Брэсця, Пінска, Давыд-Гарадка актыўна ўдзельнічала ў *вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54.* У Паўночную вайну 1700—21 многія гарады і нас. пункты разбураны і разрабаваны. У выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) да Расіі далучана ўсх. Брэстчына, 3-га падзелу (1795) — астатняя частка вобласці. Спачатку тэр. Б. в. была ўключана ў Мінскую і Слонімскую, у 1796 — у Літоўскую, а з 1801 — у Гродзенскую губ. У час паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі рус. войскі пад камандаваннем А. В. Суворава разбілі пад Крупчыцамі (6.9.1794) і Брэстам (8.9.1794) корпус ген. Ю. Серакоўскага. У Айч. вайну 1812 пад Кобрынам (15.7.1812) разбіта група войск Напалеона I. 31 ліп. (12 жн.) каля в. Гарадзечна (Пружанскі р-н) адбылася *Гарадзечанская бітва 1812.* У час паўстання 1863 на Пд Брэстчыны змагаўся паўстанцкі атрад Р. *Траўгута.*

У 70—80-я г. 19 ст. ўзнікаюць значныя прамысл. прадпрыемствы — запалкавая ф-ка «Прагрэс-Вулкан» у Пінску, суконныя ф-кі ў Ружанах і Парэччы і інш., пракладзены Палескія і Маскоўска-Брэсцкая чыгункі. Фарміруецца пралетарыят, пачынаецца рабочы рух. У 90-я г. з'яўляюцца с.-д. гурткі. У 1897 у Брэсце існавала тайнае т-ва рабочых і рамеснікаў; у 1897—98 адбыліся першыя забастоўкі рабочых. У 1903—04 узнікаюць *Брэсцкая арганізацыя РСДРП, Пінская арганізацыя РСДРП.* Працоўныя актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. Паліт. выступленні і забастоўкі рабочых адбыліся ў Баранавічах, Брэсце, Пінску, Лунінцы; сялян — у Пінскім, Пружанскім, Кобрынскім і інш. паветах. У кастр. 1905 узніклі стачачныя к-ты, якія кіравалі барацьбой рабочых. Адбыліся *Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906, Баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905,* хваляванні салдат у Пінскім гарнізоне. Царскі ўрад разграміў арг-цыі РСДРП у Брэсце, Пінску, правёў масавыя арышты ў Лунінцы, Пінску, Брэсце і інш. У 1915 амаль усю тэр. вобласці акупавалі герм. войскі. Працоўныя Брэстчыны з радасцю сустрэлі вестку пра Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыю. У неаку-

паваных паветах Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. Пасля заключэння Брэсцкага міру нас. акупаваных паветаў Брэстчыны на чале з падпольнымі рэўкомамі пачало барацьбу з герм. захопнікамі. Партыз. атрады пад камандаваннем упаўнаважанага ЦК РКП(б) А. М. *Ільіна* налічвалі 15 тыс. чал. Вясной 1919 Брэстчына акупавана бурж. Польшчай. Летам 1920 вызвалена Чырв. Арміяй. У Баранавічах, Брэсце, Кобрыне, Пінску, Пружанах створаны пав. рэўкомы. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 тэр. Б. в. ў складзе Зах. Беларусі далучана да бурж. Польшчы. Амаль 20 гадоў працоўныя вялі барацьбу за сац. і нац. вызваленне. У 20-я г. на Палессі разгарнуўся партыз. рух, кіраўнікамі якога былі К. П. *Арлоўскі*, В. З. *Корж*, С. А. *Вайпшасаў* і інш. Рэвалюц. барацьба ўзмацнілася пасля стварэння *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі* (КПЗБ, 1923). У Палескім (часткова Навагрудскім) ваяводстве дзейнічалі Брэсцкі, Пінскі і Слонімска-Баранавіцкі акруговыя і 43 раённыя і падраённыя к-ты КПЗБ. Пад кіраўніцтвам партыі дзейнічалі арг-цыі КСМЗБ, а таксама *Беларуская сялянска-рабочая грамада*, *«Змаганне»*, *Таварыства Беларускай школы* (ТБШ). У 1927 у Косаве адбылася дэманстрацыя рабочых і сялян, якую расстралляла паліцыя (гл. *Косаўскі расстрэл 1927*), у 1932—34 — забастоўкі лесарубаў Белавежскай і Ружанскай пушчаў, *Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян 1933* і інш. Для зняволення паліт. вязняў польскі бурж. ўрад стварыў у 1934 *Бярозa-Картузскі канцэнтрацыйны лагер*. У вер. 1939 Зах. Беларусь вызвалена Чырв. Арміяй і ў лістападзе ўз'яднана ў адзінай Беларускай Савецкай дзяржаве. Пачалося сацыяліст. будаўніцтва. Створаны Брэсцкая, Баранавіцкая, Пінская вобл. З першых дзён Вял. Айч. вайны тэр. Б. в. стала месцам жорсткіх баёў сав. войск з ням.-фаш. захопнікамі. Легендарнай славай авеяны абаронцы Брэсцкай крэпасці, якія каля месяца змагаліся з ворагам (гл. *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*). У 1942 створаны *Пінскі падпольны абком КП(б)Б*, у 1943 — *Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б* і *Баранавіцкі падпольны абком КП(б)Б*, якія кіравалі партыз. барацьбой. Дзейнічалі *Баранавіцкае партызанскае злучэнне*, *Брэсцкае партызанскае злучэнне*, *Пінскае партызанскае злучэнне*. У Баранавічах, Пінску, Кобрыне і інш. дзейнічалі камуністычнае, камсамольскае, антыфашысцкае падполлі. У маі 1942 створаны *Баранавіцкі акруговы антыфашысцкі камітэт* і Камітэт барацьбы з ням. акупантамі ў Брэсце, які летам 1943 ператвораны ў *Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт*. На тэр. вобласці падпольна выдаваліся газеты: 3 абласныя, гарадская, 16 раённых, маладзёжныя і антыфаш. камітэтаў. За гады акупацыі ням. фашысты разбурылі амаль усе прамысл. прадпрыемствы і ўстановы, абрабавалі калгасы і саўгасы, МТС, спалілі сотні нас. пунктаў, забілі, павесілі і спалілі жывымі больш за 300 тыс. жыхароў. У выніку *Беларускай аперацыі 1944*, *Баранавіцка-Слонімскай аперацыі 1944*, *Люблінска-Брэсцкай аперацыі 1944* Брэстчына вызвалена ад ням.-фаш. захопнікаў. Даваенны ўзровень прамысл. адноўлены да 1948; да 1951 амаль закончана калектывізацыя с. гасп. У студз. 1954 да Б. в. далучаны *Пінская вобласць* і 4 р-ны *Баранавіцкай вобласці*. Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 17.7.1967 за актыўны ўдзел у партыз. руху, мужнасць і стойкасць працоўных у барацьбе з ням.-фаш. захопнікамі ў перыяд Вял. Айч. вайны, за поспехі ў аднаўленні і развіцці нар. гасп. Б. в. узнаг. ордэнам Леніна.


Гаспадарка. У складзе бурж. Польшчы гэта быў адсталы аграрны раён. Панам і кулакам належала 75% зямельных угоддзяў. Каля 20% сялянскіх гаспадарак не мелі зямлі. Прамысловасць была наўсаматужная. Сацыяліст. буд-ва, якое пачалося пасля ўз'яднання з БССР, перапыніла Вял. Айч. вайна. Страты, прычыненыя гаспадарцы вобласці ням.-фаш. захопнікамі, склалі больш за 1 млрд. 45 млн. руб. (у новым вылічэнні).

Прамысловасць. За пасляваенныя гады створаны галіны прамысловасці: эл.-техн., баваўняная, металаапр., будаўнічая, цукровая і інш. Валавая прадукцыя прамысл. вобласці ў пасляваенныя гады расла хутчэй, чым у сярэднім па рэспубліцы. На Б. в. (1969) прыпадае 100% агульнарэсп. вытворчасці газавых пліт, амаль 100% электралямпаў, каля 85,6 баваўняных тканін, 62,4 верхняга трыкатажу, 42,6% эл. энергіі. Пра развіццё прамысловасці вобласці гл. табл. 1.

Табліца 1


Асноўныя паказчыкі развіцця прамысловасці Брэсцкай вобласці

	1940	1945	1965	1969
Рост валавой прадукцыі прамысловасці (1940 г. прыняты за адзінку)	1	0,5	11	21
Вытворчасць найважнейшых відаў прамысловай прадукцыі:				
электраэнергіі, млн. *квт·гадз*	15,9	9,0	2588	5113,7
торф паліўны, тыс. *т*	72	57	718	983
цэгла будаўнічая, млн. шт.	17,6	3,6	163,2	198,1
газавыя пліты, тыс. шт.	—	—	146,9	240,1
тканіны баваўняныя, тыс. *м*	—	—	916	57 162
верхні трыкатаж, тыс. шт.	37	16	2769	12 800
цукар-пясок, тыс. *т*	—	—	40,1	58,3
мяса (уключаючы субпрадукты 1-й катэгорыі), тыс. *т*	10	2	40	59
масла, тыс. *т*	0,4	0,4	9,3	9,2
кансервы, млн. умоўных слоікаў і бляшанак	0,08	0,06	66,8	81,4



Пінскі камбінат верхняга трыкатажу. Вязальны цэх, катонны ўчастак.

У вобласці створана магутная энерг. база — *Віроўская ДРЭС* (920 тыс. *квт*), павялічылася магутнасць эл. станцый у Брэсце, Баранавічах, Пінску. З торфапрадпрыемстваў найбольшыя каля Баранавіч (Каўпеніца) і Івацэвіч. Шырока вядомы *Брэсцкі электралямпавы завод*, *Брэсцкі завод вагавай апаратуры*. Найб. значныя маш.-буд. прадпрыемствы: з-д гандл. абсталявання, прылад для



Галоўны пункт кіравання Жабінкаўскага цукровага завода.

станкоў, аўтамаб. агрэгатаў у Баранавічах, інструментальны з-д у Кобрыне, ліцейна-механічны і суднарамонтны ў Пінску. Сярод дрэваапр. прадпрыемстваў найбольшыя: фанера-запалкавы камбінат у Пінску, лыжная ф-ка ў Целяханах, мэблевыя ф-кі ў Брэсце, Пінску, Баранавічах, лесазаводы ў Івацэвічах і Мікашэвічах. Найб. прадпрыемствы лёгкай прамысловасці: *Баранавіцкі баваўняны камбінат*, *Брэсцкі дывановы камбінат* і *Брэсцкі панчошны камбінат*, суконная ф-ка ў Брэсце, трыкатажны камбінат у Пінску. Найб. прадпрыемствы харч. прамысловасці і мясакамбінаты ў Брэсце, Баранавічах, Пінску, птушкакамбінат у Кобрыне, млынкамбінаты ў Баранавічах, Пінску, пладова-агародніна-кансервавыя з-ды ў Кобрыне, Ганцавічах, Ляхавічах і інш., піва-вінаробны камбінат у Брэсце, з-д кармавога біяміцыну ў Пінску, лікёра-гарэлачны з-д (Брэст). Недалёка ад Жабінкі цукр. з-д. Прадпрыемствы буд. м. працуюць пераважна на патрэбы вобласці. У Пінску комплекс прадпрыемстваў па вытворчасці буд. м. (жалезабетонныя канструкцыі, сталярныя і сан.-тэхн. вырабы); паблізу ст. Гарынь (каля Століна) будуецца (1970) з-д для вырабу дрэнажных, а ў Ганцавічах працуе (1970) з-д жалезабетонных вырабаў.

Сельская гаспадарка. С.-г. вытворчасць вобласці вызначаецца высокім узроўнем механізацыі, інтэнсіфікацыі і таварнасці. Гал. галіны — земляробства і жывёлагадоўля. На 1.1.1970 у вобласці было 323 калгасы і 66 саўгасаў. У 1969 у с. гасп. выкарыстоўвалася: 10 554 трактары, 3029 збожжаўборачных камбайнаў, 7123 груз. аўтамабілі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 46% тэр., у т. л. пад worнымі землямі 26,2%, сенажацямі 9,8, пашаю 9,5%. (Пра структуру пасяўных пл. гл. табл. 2.) З 1940 да 1968 пасяўная пл. вобласці павялічылася на 202 тыс. *га* (34%).


Табліца 2

Структура пасяўных плошчаў Брэсцкай вобл. (у працэнтах ад усёй пасяўной плошчы)

	1940	1945	1960	1965	1969
Збожжавыя	73,3	72,9	44,1	49,9	45,9
Тэхнічныя	2,3	1,9	6,5	6,7	5,9
Агародніна	1,1	1,1	1,0	1,0	0,9
Бульба	19,1	20,5	19,7	18,2	17,6
Кармавыя	4,2	3,6	28,7	24,2	29,7

У 1969 пад пасевамі (тыс. *га*) 802,3, у т. л. пад збожжавымі і вернебабовымі 368,3 (пад жытам 143,9, пад пшаніцай 93,7, пад ячменем 56,1, пад аўсом 32,2); кармавымі 239,3; бульбай 141,0; тэхн. культурамі 46,4; агародніна 7,2. Жыта і лён вырошчваюцца ўсюды, вял. пасевы пшаніцы на ПпЗ вобласці. Сеюць ячмень і грэчку. Цукр. буракі ў Кобрынскім, Брэсцкім і Камянецкім р-нах. Пасевы бульбы пераважна ва ўсх. частцы вобласці (Лунінецкі, Ляхавіцкі, Столінскі

Малочна-таварная ферма калгаса «Зара» Кобрынскага раёна.



р-ны), а таксама ў прыгарадах. Кармавыя культуры ў паўн. і паўн.-ўсх. раёнах, дзе менш лугоў і пашы. Жывёлагадоўля малочна-мясного і мяса-малочнага кірунку. (Пра змены пагалоўя жывёлы ў вобл. гл. табл. 3.)

Табліца 3

Пагалоўе жывёлы ва ўсіх гаспадарках Брэсцкай вобласці (тыс. галоў на канец года)

	1940	1945	1960	1965	1969
Буйная рагатая жывёла	507,2	282,6	590,6	726,2	768,1
у т. л. кароовы	362,8	193,0	320,1	362,8	388,2
Свінні	378,7	125,6	482,8	520,3	504,3
Авечкі	534,8	188,8	207,5	152,2	111,2

Падсобныя заняткі насельніцтва — рыбалоўства, паляванне, паляванне.

Транспарт. Гал. від транспарту — чыгункі, даўж. іх 1050 *км*. Найважнейшыя чыг. Масква — Брэст, Гомель — Брэст, Вільнюс — Роўна; чыг. вуалы Брэст, Баранавічы, Лунінец, Жабінка. Хутка развіваецца аўтамаб. транспарт. Даўж. аўтамаб. дарог 10,5 тыс. *км*, з цвёрдым пакрыццём 3,3 тыс. *км*. Гал. магістраль Мінск — Брэст. Вял. значэнне мае водны транспарт. Суднаходства па Прыпяці, Піне, Мухаўцы, Дняпроўска-Бугскім канале, Стыры, Гарыні, Шчары. Па Дняпроўска-Бугскім канале (даўж. каля 196 *км*) перавозяць жал. і марганцавую руду з Украіны ў Польшчу, буд. матэрыялы. Для ўнутр. перавозак карыстаюцца і паветр. транспартам. Па тэр. Б. в. з У на З праходзіць трансеўрапейскі нафтаправод «Дружба», а з ПдЗ на ПнУ газаправод Дашава — Мінск.

Ахова здароўя. У 1940 у Б. в. было 80 бальнічных устаноў на 3565 ложкаў, 20 жаночых і дзіцячых кансультацый. Прапавала 520 урачоў, акрамя таго 92 зубныя; 1850 сярэдніх мед. работнікаў. На пачатак 1969 у Б. в. было 143 бальнічныя ўстановы на 11 460 ложкаў, у т. л. 3 радзільныя дамы (450 ложкаў), 4 дзіцячыя бальніцы (415 ложкаў), 10 бальніц для туберкулёзных хворых (420 ложкаў), 1 інфекцыйная бальніца (100 ложкаў), 21 стацыянар пры дыспансерах (1258 ложкаў), 33 амбулаторыі і паліклінікі (не аб'яднаныя са стацыянарамі), 26 дыспансераў (21 з іх маюць стацыянары), 4 стаматалагічныя паліклінікі. Працавала 1940 урачоў (з іх 283 зубныя), 7161 чал. сярэдняга мед. персаналу, 628 правізараў і памочнікаў правізараў. Дзейнічаюць 7 санаторыяў (з іх 1 для дзяцей, хворых на рэўматызм).

Культура. Паводле перапісу 1931 было непісьменным 48% дарослага насельніцтва б. Палескага ваяводства. У 1936/37 навуч. г. 773 нас. пункты не мелі школ, 1267 школ размяшчаліся ў наёмных памяшканнях, 30 855 дзяцей школьнага ўзросту не наведвалі школы, на аднаго настаўніка прыпадала 76 вучняў. Было толькі 14 гімназій, у т. л. 9 прыватных; не было дашкольных дзіцячых устаноў, сярэдніх спец. навуч. устаноў і ВНУ.

У Б. в. (1970) 230 дашкольных дзіцячых устаноў (24 264 дзіцяці). У 1969/70 навуч. г. было 1582 агульнаадук. школы ўсіх відаў (272 268 вучняў), у т. л. 374 васьмігадовыя і 340 сярэдніх; 16 прафесійна-тэхн. вучылішчаў (9224 навучэнцы); 18 сярэдніх спец. навуч. устаноў (19 624 навучэнцы); 2 ВНУ (пед. і інж.-буд. ін-ты; 6,8 тыс. студэнтаў). На 1.1.1970 было 1181 масавая б-ка (7985 тыс. тамоў); 772 клубныя ўстановы, у т. л. 57 Дамоў культуры; 957 кінаўстановак; 8 музеяў (*Кобрынскі ваенна-гістарычны музей, Бяровайскі гісторыка-рэвалюцыйны музей* і інш.). Выдаецца 17 газет, у т. л. абласная «Заря» (тыраж 76 тыс. экз.), 2 аб'яднаныя і 14 раённых (агульны тыраж 121,4 тыс. экз.). Пры клубных установах 3029 гурткоў і калектываў маст. самадзейнасці (38,5 тыс. удзельнікаў), у т. л. 10 народных; харавая капэла і нар. тэатр клуба чыгуначнікаў у Брэсце, нар. тэатры ў Баранавічах, Пінску, Целяханах, народны хор в. Вялікае Падлессе Ляхавіцкага р-на і інш.

Літ.: Акинчиц А. С. Брестская область, Мн., 1962; Кухаренко Ю. В. Первобытные памятники Полесья, М., 1962; Ягож. Памятники железного века на территории Полесья, М., 1961; Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси, М., 1950; Рэвалюцыйны пад'ём у Літве і Беларусі 1861—1862 гг., М., 1964 (Восстание 1863 г. Материалы и документы); Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.), Мн., 1966; Липило П. П. КПБ — организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959; Рашевский Н. Белорусская ССР. Брестская область, Мн., 1968.

У. А. Навіцкі (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *У. Ф. Ісаенка* (археалогія). Мінск; *М. І. Алексюк* (гістарычны нарыс), *В. І. Камейша* (гістарычны нарыс, культура). Брэст.

БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ, умацаванне для аховы вах. граніц Расіі, пабудаванае ў 30—40-я г. 19 ст. на месцы старога Брэста. Першы камень будучай Цытадэлі закладзены 1.6.1836. Будавалася крэпасць паводле праекта рус. ваен. інжынераў: ген. К. І. Опермана, Малецкага і палк. Фельдмана. Да 1842 утвораны 4 астраўныя ўмацаванні: цэнтральнае (Цытадэль), якое магло ўмясціць 12 тыс. чал., Цярэспальскае (Заходні в-аў), Валынскае (Паўднёвы в-аў), Кобрынскае (Паўночны в-аў). Адкрыта 26.4.1842. Агульная плошча складала 4 км². Даўжыня гал. крапаснай лініі 6,4 *км*. Цытадэль — самкнёная абарончая двух'ярусная казарма з 500 казематамі, даўжынёй 1,8 *км* і 4 варотамі: Цярэспальскімі (з канатным мостам цераз Буг), Холмскімі (з пад'ёмным мостам цераз Мухавец), Белastоцкімі і Брэсцкімі. Ніпы з байніцамі і амбразурамі аздоблены белакаменнымі ліштвамі і прыстасаваны для размяшчэння артылерыі і стралкоў. Холмскія і Цярэспальскія вароты мелі невялікія дазорныя вежы. Цярэспальскае, Валынскае і Кобрынскае ўмацаванні злучаліся з Цытадэллю мастамі, былі абнесены

земляными валамі вышынёй 10 *м* з цагляными арачнымі казематамі ўсярэдзіне. Арх. цэнтрам Цытадэлі была гарнізонная царква (1856—79). Пры пабудове крэпасці былі захаваны Белы палац (пабудаваны ў 1620) і будынак Інж. ўпраўлення (пабудаваны ў 1679), знішчаны гітлераўцамі ў 1941. У 1864 паводле патрабавання ген. Э. І. Татлебена Б. к. рэканструявана: пабудаваны 2 рэдуты, траверсы, парахавыя скляпы і склады. У 1869, 1878—88 створаны яшчэ 10 фортаў, агульны абвод фортавай лініі 30 *км*. У Б. к. размяшчаўся вялікі гарнізон. У перыяд першай рус. рэвалюцыі тут адбыліся *Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906*. Напярэдадні 1-й сусв. вайны ў 1911—14 пачалося буд-ва 2-й лініі фортаў, у якім удзельнічаў ваен. інж. Дз. М. *Карбышаў*. У 1913 нач. лабараторыі рыштунку В. А. Арцем'еў выпрабаваў тут першую рус. ракету. У жн. 1915 рус. камандаванне, баючыся абходу крэпасці з флангаў ням. войскамі, эвакуіравала гарнізон, а некат. ўмацаванні ўзарвала. 22.12.1917 у будынку Інж. ўпраўлення пачаліся перагаворы пра мір. 3.3.1918 у Белым палацы на тэр. Цытадэлі падпісаны *Брэсцкі мір 1918* з Германіяй. У вер. 1939 у час нападу гітлераўскай Германіі на Польшчу частка Цытадэлі разбурана, будынкі Белага палаца і Інж. ўпраўлення пашкоджаны. На пач. Вял. Айч. вайны Б. к. не мела ранейшага значэння і выкарыстоўвалася для размяшчэння войск Чырв. Арміі. 22.6.1941 гарнізон крэпасці прыняў першы ўдар фашыстаў (гл. *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*). 8.5.1965 Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР Б. к. прысвоена ганаровая назва «Крэпасць-герой» з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». На тэр. В. к. створаны *Брэсцкай крэпасці-героя музей*. Іл. гл. на ўкл.

І. Дз. Белагорцаў, Л. У. Кісялёва. Брэст.

БРЭСЦКАЯ УНІЯ 1596, аб'яднанне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў на тэр. Рэчы Паспалітай. Абвешчана на царкоўным саборы ў Брэсце. Паводле замыслу кіруючых колаў Польшчы і каталіцкай царквы мела на мэце дэнацыяналізаваць, паланізаваць бел. і ўкраінскі народы, адарваць іх ад брацкага рускага народа, умацаваць панаванне каталіцкага духавенства на Беларусі і Украіне, аслабіць антыфеад. рух нар. мас. Гал. ролю ў падрыхтоўцы Б. у. адыгралі Ватыкан і езуіты, якія распачалі сваю дзейнасць яшчэ ў 80-я г. 16 ст.: распрацоўвалі планы падпарадкавання Рускай дзяржавы паліт. і ідэалаг. ўплыву Рыма, збіралі звесткі пра яе эканам. і ваен. становішча, стваралі свае апорныя пункты на Беларусі і Украіне. Паводле Б. у. праваслаўная царква Беларусі і Украіны мусіла прызнаць вярхоўенства папы і асноўныя догматы каталіцкай царквы. Аднак, каб не выклікаць нар. хвалявання, выкананне набажэнстваў пакідалася на царкоўнаславянскай мове (гл. *Уніяцтва*). Вярхі праваслаўных духоўных і свецкіх феадалаў, каб зберагчы і ўмацаваць свае саслоўныя, эканам. і паліт. пазіцыі, падтрымалі унію. Сярод іх кіеўскі мітрапаліт, брэсцкі, луцкі, пінскі епіскапы і інш. Аднак ва ўмовах нар. хвалявання частка праваслаўных буйных феадалаў (кн. К. Астрожскі), заможных гараджан, духавенства выступала супраць уніі. Пашырэнне Б. у. выклікала супраціўленне бел. і ўкр. народаў, якія стойка змагаліся за сваю нац. культуру, мову, звычаі (гл. *Брацтвы*). У выніку гэтай барацьбы Рэч Паспалітая ў 1633 была вымушана даваліць легальнае існаванне праваслаўнай царквы на тэр. Беларусі. Б. у. ліквідавана на тэр. Беларусі пасля яе ўз'яднання з Расіяй Полацкім саборам 1839. На тэр. Зах. Украіны, што да 1918 уваходзіла ў Аўстра-Венгерскую імперыю, а ў 1921—39 — у бурж. Польшчу, уніяцкая царква існавала да скасавання яе царкоўным саборам у Львове ў 1946.

Літ.: Коялович М. О. Литовская церковная уния, т. 1—2, СПб., 1859—61; Бантыш-Каменский Н. Н. Историческое известие о возникшей в Польше унии..., Вильно, 1864; Мараш Я. Н. Роль Ватикана в подготовке и утверждении Брестской унии 1596 г., у зб.: Вопросы истории религии и атеизма, т. 11, М., 1963; Ягож. Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви, Мн., 1969; Перцаў В. Брэсцкая унія, «Беларусь», 1947, № 2; Жуковичъ П. Н. Сеймовая борьба западнорусского дворянства с церковной унией, в. 1—6, СПб., 1901—12.

Я. Н. Мараш. Гродна.

БРЭСЦКАЯ ЎПАДЗІНА, тэктанічная структура Рускай платформы на ПдЗ БССР у зоне апускання крышталічнага фундаменту, якая аблямоўвае Беларускі крышталічны масіў. На Пн мяжуе з Беларускім масівам і Лукаўска-Вішніцкім падняццем, на У з Палескай седлавінай, на ПдУ з Ратнаўскім выступам фундаменту, на З яна адкрыта ў бок Польшчы, дзе размяшчаецца больш глыбокая яе частка — Падляскае апусканне. Разам яны ўтвараюць Брэсцка-Падляскую ўпадзіну. Б. ў. вызначаецца пагружэннем крышталічнага фундаменту (да глыб. 1,6—1,8 *км*) і паверхняў пашыраных у яе межах верхнепратэразойскіх, ніжнепалеазойскіх (кембрый, ардовік) і сілурыйскіх адкладаў ад Беларускага крышталічнага масіву, Палескай седлавіны і Ратнаўскага выступу ў бок Брэста і далей на З. Фарміраванне ўпадзіны як самастойнай тэктанічнай структуры адбывалася на тэр. Беларусі ў раннім палеазоі і сілуры. З пач. дэвону і да раннепермскай эпохі ўключна плошча Б. у. і сумежных з ёю інш. тэктанічных структур была часткаю кантынента, на якой адбываліся інтэнсіўныя працэсы дэнудацыі. З позняй пермі пачаўся новы этап пагружэння Б. у., які ахапіў з перапынкамі мезазой, палеагенавы і неагенавы перыяды. Гэта абумовіла пашырэнне ў яе межах магутнай тоўшчы меза-кайназойскіх (пераважна верхнеюрскіх і верхнемелавых) адкладаў. У меза-кайназоі сыходныя тэктанічныя рухі панавалі і ў прылеглых раёнах Беларускага крышталічнага масіву, Палескай седлавіны і Ратнаўскага выступу, якія разам з Б. у. былі кралявой часткай Мазавецка-Люблінскай мульды. Верхнепратэразойскія і кембра-сілурыйскія адклады Б. у. перспектыўныя на выяўленне нафты, у неагенавых адкладах вы-

яўлены бурыя вугалі (Кобрынскі, Пружанскі, вах. ч. Драгічынскага р-на і інш.).

Літ.: Горелик З. А. Основные черты истории тектонического развития и перспективы нефтегазоносности Брестской впадины на территории БССР, у зб.: Геологическое строение и перспективы нефтегазоносности БССР, М., 1966; Зиновенко Г. В. и Махнач А. С. История формирования Брестской впадины, «Доклады АН БССР», 1969, т. 13, № 6. *З. А. Гарэлік.* Мінск.

БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ АНТЫФАШЫСЦКІ КАМІТЭТ, падпольная патрыятычная арганізацыя, якая ў гады Айч. вайны пад кіраўніцтвам *Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б* узначальвала дзейнасць антыфашысцкіх арганізацый на тэр. паўночных і цэнтральных раёнаў Брэсцкай вобл. Створаны 12.5.1942 па парадзе кіраўнікоў антыфаш. арг-цый і груп Брэсцкай вобл. як міжраённы Камітэт барацьбы з ням. акупантамі. Узначальваў антыфаш. рух у Бярозаўскім, Камянецкім, Косаўскім, Пораззаўскім, Пружанскім, Ружанскім, Шарашоўскім, а пазней і ў інш. р-нах Брэсцкай, а таксама суседніх р-нах Баранавіцкай і Беластоцкай абл. Паводле рашэння ЦК КП(б)Б у ліп. 1943 рэарганізаваны ў Б. а. а. к., а раённыя антыфаш. арг-цыі Баранавіцкай і Беластоцкай абл. перададзены ў падпарадкаванне падпольных міжрайкомаў і райкомаў КП(б)Б. Напярэдадні вызвалення ад акупантаў камітэт аб'ядноўваў у 11 раённых арг-цыях 422 ячэйкі, якія налічвалі 1893 падпольшчыкаў і некалькі соцень т. зв. сімпатыкаў. Яго ўзначальвалі былыя чл. КПЗБ І. П. *Урбановіч*, І. І. Жышка, М. Е. *Крыштафовіч*, а таксама Я. М. *Афанасьеў*, А. Журба і інш. Пад кіраўніцтвам Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б камітэт стварыў антыфаш. арг-цыі і групы, узначальваў іх дзейнасць, праводзіў масавую палітычную работу для мабілізацыі працоўных на барацьбу з акупантамі. Друкарня камітэта распачала работу ў ліп. 1942, выдала 168 тыс. экз. адозваў, лістовак, уводак Саюзінфармбюро, газет і інш. матэрыялаў на бел., рус., польскай і ням. мовах; са снеж. 1943 выпускала газ. «За Родину». Пад кіраўніцтвам Камітэта барацьбы з ням. акупантамі створаны і дзейнічалі партыз. атрады (да кастр. 1942 было 7 атрадаў — 1500 партызанаў), на базе якіх летам 1943 узніклі *партызанская брыгада «Савецкая Беларусь»* і *партызанская брыгада імя П. К. Панамарэнкі.* Падпольшчыкі здабывалі і перадавалі партызанам зброю, харчы, медыкаменты, вялі разведку, распаўсюджвалі сярод насельніцтва і ў варожых гарнізонах антыфаш. л-ру; разам з партызанамі знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага, узрывалі эшалоны, аўтамашыны, разбівалі варожыя гарнізоны (у Косаве, Рудніках, Войтавым Мосце, Шчытне, Трыбушках і інш.).

А. А. Фактаровіч. Мінск.


БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР імя Леніпскага камсамола Беларусі, створаны ў 1944 з выпускнікоў Маскоўскага гарадскога тэатральнага вучылішча. Адкрыўся ў Брэсце 13.11.1945 спектаклем «Мяшчане» М. Горкага, падрыхтаваным у часе вучобы. Гал. рэж. М. *Міцкевіч.* У творчасці т-р прытрымліваецца гераіка-рамант. кірунку. Асн. месца ў рэпертуары займае сучасная п'еса. У развіцці т-ра значная роля належыць рэжысёрам — засл. дзеячам маст. БССР Ю. *Арынянскаму* і А. *Міронскаму*, нар. арт. БССР Г. *Волкаву* (з 1965 гал. рэж. т-ра). У складзе трупы (1970): нар. артысты БССР Т. Заранок і А. Логінаў, засл. артысты БССР М. Абрамаў, А. Асторына, Н. Ганчарэнка, С. Еўдашэнка, Г. Качаткова, А. Самараў, Г. Токараў, Б. Уксусаў, Ю. Уласаў, С. Юркевіч; акцёры Р. Барзова, А. Вятошкін, З. Курдзянок, У. Лісоўскі, У. Пестуноў, Р. Семічава, А. Чарноцкі і інш.; мастак А. Марозаў. Т-р няраз гастраліраваў у Польшчы.



Сцэна са спектакля «Брэсцкая крэпасць».

АСНОЎНЫЯ СПЕКТАКЛІ

1947 — «Маладая гвардыя» А. Фадзеева. 1948 — «Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага. 1950 — «Сям'я» І. Папова. 1952 — «Любоў Яравая» К. Транёва, «Зыкавы» М. Горкага, «Ветрык, вей!» Я. Райніса, «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава. 1954 — «Гады вандраванняў» А. Арбузава, «Чайка» А. Чэхава. 1955 — «Апошнія» М. Горкага, «У добры час!» В. Розава. 1957 — «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна. 1960 — «Тры сястры» Чэхава, «Іркуцкая гісторыя» Арбузава. 1961 — «Ганна Карэніна» паводле Л. Талстога, «Сабака на сене» Лопэ дэ Вэга. 1963 — «Арганаўты» Ю. Эдліса. 1964 — «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава, «Атэла» У. Шэкспіра, «Фінал» П. Строгава. 1966 — «Дзень цішыні» М. Шатрова. 1967 — «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна. 1968 — «Гросмайстарскі бал» паводле І. Штэмлера. Пастаўленыя творы бел. драматургаў: 1948 — «Ірынка» К. Чорнага. 1949 — «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона. 1953 — «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка. 1958 — «Кветка шчасця» І. Козела. 1965 — «Чатыры крыжы» А. Дайлендзіка. 1966 — «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна. 1969 — «Брэсцкі мір» К. Гу-



1


2

3

4

Брэсцкая крэпасць I.

1. Крэпасць Брэст-Літоўск у 1840 (з карціны мастака Б. Залескага).
2. Цярэспальскія вароты.
3. Белы палац.
4. Інжынернае ўпраўленне.
5. Надпіс невядомага воіна на сцяне Цытадэлі.
6. Загад № 1 па гарнізоне Брэсцкай крэпасці ад 24.6.1941.
7. Абаронцы Брэсцкай крэпасці (з карціны мастака П. Крываногава).



5

6

7



1



2



3



4

Брэсцкая крэпасць II. 1. Холмскія вароты. 2. Па мясцінах баёў. 3. Руіны форта. 4. Руіны колішняй крапасной царквы. 5. Каля музея абароны Брэсцкай крэпасці-героя. 6. Ушанаванне памяці герояў.



5



6

барэвіча. Спектаклі пра абарону Брэсцкай крэпасці: 1953 — «Брэсцкая крэпасць» Губарэвіча (прэмія ВЛКСМ 1967). 1968 — «Людзі і камяні» Губарэвіча. *А. А. Лабовіч.* Мінск.

БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ, заснаваны ў 1950, адкрыты 22.6.1957. У фондах і 11 экспазіцыйных залах музея (пл. 873 *м*²) больш за 37 тыс. экспанатаў. Аддзелы: прырода, гісторыя дасавецкага і сав. перыядаў. У аддзеле прыроды — экспанаты раслінага і жывёльнага свету вобласці, агучаная дыярама запаведніка Белавежская пушча (мастак У. В. Старчакоў). У аддзеле гісторыі дасавецкага перыяду сабраны палеанталагічныя, археал. і нумізматычныя калекцыі; зброя і даспехі воінаў 11—18 ст.; рэдкія рукапісныя і друкаваныя кнігі (трэбнік 1646 з Брэсцкай царквы, Гошчаўскі царкоўны летапіс); макет Брэста 18 ст., герб і пячатка горада, матэрыялы гісторыі *Брэсцкай крэпасці*, у т. л. карты, планы, памятная бронзавая дошка 1836 пра заснаванне крэпасці; армейская амуніцыя часоў Айч. вайны 1812; багаты этнаграфічны матэрыял, у т. л. муз. інструменты 18 ст. (цытра, муз. шкатулка), прылады працы, вопратка і рэчы хатняга ўжытку сялян 19 ст. Аддзел гісторыі сав. перыяду мае раздзелы: Брэстчына 1917—41, Вял. Айч. вайна 1941—45, пасляваен. сацыяліст. буд-ва. Сярод экспанатаў — дакументы, баявыя рэліквіі, узнагароды, іменная зброя, асабістыя рэчы і фотаздымкі праслаўленых землякоў — удзельнікаў Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны (камісара 25-й Чапаеўскай дывізіі А. Ф. Пятроўскага, упаўнаважанага па арг-цыі ВРК на Беларусі ў 1920 М. М. Стасевіча). Шырока паказана барацьба працоўных Зах. Беларусі на чале з КПЗБ за сац. і нац. вызваленне, за ўз'яднанне з БССР. Дэманструюцца матэрыялы пра падпольныя к-ты і ячэйкі КПЗБ, дзеячаў КПЗБ (В. З. *Харужую*, С. С. *Панкову*, У. З. *Царука*, З. Ф. *Паплаўскага*), *Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян 1933*, жорсткі акупац. рэжым польскіх улад на тэр. былога Палескага ваяводства, у т. л. ў *Бярозе-Картускім канцэнтрацыйным лагеры*, пра вызв. паход Чырв. Арміі ў вер. 1939. У раздзеле Вял. Айч. вайны экспануюцца матэрыялы пра *Брэсцкай крэпасці абарону 1941*, у т. л. агучаная дыярама абароны Брэсцкай крэпасці (мастак П. С. Дурчын, скульптар Ф. Ф. Зільберт); пра партыз. рух на тэр. вобласці і яго кіраўнікоў (С. І. *Сікорскага*, А. Я. *Кляшчова*, В. З. *Каржа*, І. П. *Урбановіча*), пра вызваленне Брэстчыны Сав. Арміяй (гл. *Баранавіцка-Слонімская аперацыя 1944*, *Люблінска-Брэсцкая аперацыя 1944*), пра Герояў Сав. Саюза, якія праславіліся пры вызваленні вобласці ад ням.-фаш. захопнікаў і пра герояў-землякоў (С. І. *Грыцаўца*, Г. М. *Халасцякова*, І. П. *Мазурука*, С. А. *Бабрука*). У раздзеле пасляваен. сацыяліст. буд-ва выстаўлены матэрыялы пра самых лепшых працаўнікоў Брэстчыны, узоры прадукцыі вядучых прадпрыемстваў вобласці.

Пры музеі створаны секцыі старых бальшавікоў, былых чл. КПЗБ, удзельнікаў партыз. руху і клуб краязнаўцаў «Радзіма». Музей вядзе работу па выяўленні і ўвекавечванні мясцін рэвалюц. падзей, гераічных подзвігаў воінаў і партызанаў у Вял. Айч. вайну. У 1969 музей наведала каля 111 тыс. чал. У філіяле музея *Камянецкая вежа* экспануюцца матэрыялы з гісторыі г. Камянца.

Літ.: Брестский краеведческий музей. [Альбом], Мн., 1967. *М. М. Слепакова.* Брэст.

БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ТЭАТР ЛЯЛЕК, створаны ў 1968 з лялечнай групы, якая існавала пры Брэсцкім абл. драм. т-ры імя ЛКСМБ. Гал. рэж. А. Сярогін. У рэпертуары: «Выкраданне цыбулінкі» па Дж. Радары, «Васіліса Прыгожая» К. Чарняк, «Дзед і жораў» В. Вольскага, «РВС» паводле А. Гайдара, «Сястрычка Аленка і братка Іванка» Ю. Данцыгера і інш.


БРЭСЦКІ БЕСКУРГАННЫ МОГІЛЬНІК, могільнік з трупаспаленнем 2—4 ст. на тэр. Брэста (былая в. Трышын). Адкрыты ў 1960. Раскопкі рабіў Ю. У. Кухарэнка ў 1960—63, ускрыта тэрыторыя пл. 900 *м*² на глыбіні 0,2—0,4 *м*. Выяўлена 70 пахаванняў у круглых (дыяметрам 0,25—0,8 *м*) і прадаўгаватых (*м*) (0,7—1,2 × 0,45—0,5) ямах. Знойдзена некалькі дзесяткаў лепных гаршкоў, місак і кубкаў. У некат. аберагліся апаленыя чалавечыя косці. У многіх ямах кальцынаваныя косці змяшаны з вуголлем і попелам. Знойдзены бронзавыя літыя фібулы, касцяныя грабяні, метал. спражкі, гліняныя прасліцы. Некат. археолагі лічаць, што Б. б. м. знаходзіўся ў зоне ўзаемадзеяння *зарубінецкай культуры* і пшэворскай. Ю. У. Кухарэнка адносіць яго да готска-гепідскай культуры. Рэчы зберагаюцца ў Брэсцкім абл. краязнаўчым музеі і Эрмітажы ў Ленінградзе.

Літ.: Kuharenko J. V. Le problème de la civilisation «gotno — gepide», en Polésie et en Volhynie, «Acta Baltico — Slavica», Białystok, 1967, [t.] 5. *Л. Д. Побаль.* Мінск.

БРЭСЦКІ ДЫВАНОВЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства лёгкай прамысловасці. Пабудава-

Будынак Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.





Аддзелачны цэх.

ны ў 1963—65; праектная магутнасць асвоена ў 1967. Асн. прадукцыя: жакардавыя пяцікалерныя высакаворсавыя двухпалотныя дываны памерам ад 1,8 да 12 $м^2$ і паўшарсцяная ворсавая пража для іх, а таксама сувенірныя дываны. У 1965 выпушчана дываноў 548 тыс. $м^2$, пражы 760 *т*, у 1969 — адпаведна 1 млн. 265 тыс. $м^2$ і 1877 *т*. У 1968 камбінат удзельнічаў у міжнар. кірмашы ў Плоўдзіве і адзначаны дыпломам. Пры камбінаце клуб, спартзала, дзіцячыя яслі-сад. Будуюцца прафілакторый, піянерскі лагер. *М. Я. Вукалаў.* Брэст.

БРЭСЦКІ ЗАВОД ГАЗАВАЙ АПАРАТУРЫ, прадпрыемства газавай прамысловасці. Створаны ў 1957 на базе рамонтна-мех. з-да. Выпускае бытавыя двух- і чатырохканфорачныя газавыя пліты, засцерагальныя клапаны, прамысл. газавыя гарэлкі і інш. газавую апаратуру. У 1958 выпусціў 480, у 1969 — 240 тыс. газавых пліт. У 1961—65 рэканструяваны, вытв. плошча павялічылася больш чым утрая. У асноўным вытв. корпусе 3 цэхі: прэсавы, механазборачны і цэх пакрыцця. Працэс вытворчасці паточна-масавы. У 1969 пачалася новая рэканструкцыя з-да, пасля заканчэння якой вытв. газавых пліт да 1973 павялічыцца ў 3 разы (больш як паўмільёна шт. у год). Працуе база адпачынку на Белым возеры (Брэсцкі р-н).

В. С. Грыневіч. Брэст.


БРЭСЦКІ ІНЖЫНЕРНА-БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ, заснаваны 1.4.1966 у Брэсце. Рыхтуе інжынераў гарадскога, прамыслова-грамадзянскага і с.-г. буд-ва, інжынераў-тэхнолагаў па ачыстцы прыродных і сцёкавых водаў; архітэктараў па с.-г. буд-ве і планіроўцы сельскіх нас. пунктаў, азеляненні гарадоў і пасёлкаў; інжынераў-гідрамеліяратараў; інжынераў-будаўнікоў па водазабеспячэнні і каналізацыі. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: с.-г. буд-ва, будаўнічы, архітэктурны, вячэрні (уключае і завочны). У 1969/70 навуч. г. займалася 2670 студэнтаў. У 1970 на 20 кафедрах 200 выкладчыкаў, сярод іх праф., д-р мастацтвазнаўства М. А. Саркісаў, 39 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Асн. навук. даследаванні ў галіне гісторыі бел. архітэктуры, горадабудаўніцтва, жыллёвага буд-ва, буд. канструкцый, механікі грунтоў, інж. геалогіі, геадэзіі, супраціўлення матэрыялаў, мясцовых буд. матэрыялаў, будаўнічай фізікі. Рэктар канд. архітэктуры І. Дз. Белагорцаў (з 1966).

БРЭСЦКІ МАНЕТНЫ ДВОР, прадпрыемства ў Брэсце, якое вырабляла металічныя грошы ў 1659—66. Створаны паводле пастановы варшаўскага сейма. Чаканіў дробныя медныя манеты — *соліды* з гербам Вял. кн. Літоўскага — пагоняй. Ад прозвішча арандатара манетнага двара Ціта Лівія Бараціні манеты ў народзе празвалі *барацінкамі*. Часта трапляюцца ў скарбах на тэр. Беларусі.

Літ.: Ryszard Antoni. Niektóre materiały do historii mennicy szelążnej za Jana Kazimierza w Brześciu Litewskim i Oliwie, «Zapiski Numizmatyczne», Kraków, 1886, № 8, s. 135—138.

М. І. Алексюк. Брэст.

БРЭСЦКІ МІР 1918, мірны дагавор паміж Сав. Расіяй і дзяржавамі германскага блоку (Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Турцыяй, Балгарыяй), падпісаны ў Брэст-Літоўску 3.3.1918, ратыфікаваны *Надзвычайным чацвёртым Усерасійскім з'ездам Саветаў* 14.3.1918 і германскім імператарам Вільгельмам II 26.3.1918. Дагавор падпісалі з сав. боку Р. Я. Сакольнікаў, Г. В. Чычэрын, Р. І. Пятроўскі, Л. М. Карахан; з герм. — Р. Кюльман, ген.



М. Гофман і інш., ад Аўстра-Венгрыі — А. Чэрнін; ад Балгарыі — А. Тошаў, П. Ганчаў, Т. Анастасаў; ад Турцыі — І. Хакі-паша і Зекі-паша.

26.10(8.11).1917 *Другі Усерасійскі з'езд Саветаў* прыняў Дэкрэт аб міры, у якім Сав. ўрад прапанаваў дзяржавам, што ўдзельнічалі ў вайне, тэрмінова заключыць перамір'е і пачаць перагаворы аб міры. Дзяржавы *Антанты* не адказалі на гэтую прапанову. Сав. ўрад быў вымушаны пачаць 20.11(3.12).1917 сепаратныя перагаворы з Германіяй і яе саюзнікамі. 2(15) снеж. ў Брэст-Літоўску падпісана пагадненне пра перамір'е, а 9(22) снеж. пачаліся мірныя перагаворы. Сав. дэлегацыя на чале з А. А. Іофе прапанавала дагавор без анексій і кантрыбуцый. Герм. прадстаўнікі 12(25) снеж. паставілі ўмову, што прымуць сав. праект дагавору, калі да яго далучацца дзяржавы Антанты. Зварот Сав. ўрада да ўрадаў дзяржаў Антанты не даў станоўчых вынікаў. Паводле ўмоў міру, прапанаваных Германіяй 5(18).1.1918, Расія траціла тэрыторыю больш за 150 тыс. $км^2$ (Польшча, Літва, частка Эстоніі, Латвіі, Украіны і Беларусі).

Унутранае і знешняе становішча Сав. рэспублікі патрабавала падпісання міру. Эканам. разруха, фактычная адсутнасць арміі не дазвалялі весці далей вайну, якая магла паставіць пад пагрозу існаванне Сав. улады. Каб даць краіне перадышку, У. І. Ленін лічыў за неабходнае згадзіцца з выключна цяжкімі ўмовамі міру. Супраць гэтага выступіла група «левых камуністаў» на чале з М. І. Бухарыным і нарком замежных спраў Л. Д. Троцкі. Яны лічылі недапушчальным пагадненне з капіталіст. светам і выступілі з апартуністычным патрабаваннем абвясціць рэвалюц. вайну міжнар. імперыялізму. У. І. Ленін настойваў на заключэнні міру. Ён прапанаваў сав. дэлегацыі зацягваць перагаворы, а ў выпадку ультыматуму з боку немцаў неадкладна падпісаць мір. 10.2.1918 Германія выставіла ультыматум. Троцкі, які ў гэты час узначальваў сав. дэлегацыю, не выканаў дырэктывы Саўнаркома і заявіў, што Сав. дзяржава вайну спыняе, армію дэмабілізуе, але міру падпісваць не будзе. Германія абвясціла пра ліквідацыю перамір'я. 18.2.1918 нім. войскі перайшлі ў наступленне. Вечарам 18 лют. на пасяджэнні ЦК РКП(б) пасля вострай і працяглай барацьбы У. І. Леніна і яго прыхільнікаў супраць «левых камуністаў» большасць членаў ЦК выказалася за падпісанне міру на герм. умовах, пра што 19 лют. было паведамлена герм. ўраду. Атрыманы 23 лют. адказ герм. ўрада змяшчаў яшчэ больш цяжкія ўмовы дагавору, на падпісанне якога немцы далі 48 гадзін. У ноч на 24 лют. ВЦВК і СНК прынялі нім. ўмовы міру і паведамілі герм. ўраду пра выезд сав. дэлегацыі ў Брэст-Літоўск. 3 сак. новы склад сав. дэлегацыі падпісаў мірны дагавор. 6—8 сак. VII з'езд партыі ўхваліў ленінскую палітыку міру. Яе падтрымала большасць мясцовых парт. арг-цый, у т. л. на Беларусі. Напр., 23.2.1918 Паўн.-Зах. абласны к-т партыі прыняў рэзалюцыю пра неабходнасць заключыць мір у імя выратавання рэвалюцыі і Сав. улады. 3.3.1918 аб'яднанае пасяджэнне Паўн.-Зах. абласнога, Смаленскага і Мінскага к-таў РСДРП(б) ухваліла палітыку ЦК партыі і Сав. ўрада пра заключэнне міру. Паводле Б. м. Германія акупавала Польшчу, Літву, частку Беларусі і Латвіі. Сав. войскі павінны былі пакінуць тэр. Латвіі, Эстоніі, Украіны, Фінляндыі, Аландскія а-вы, а таксама Карс, Ардаган і Батум — усяго каля 1 млн. $км^2$ тэр., якую акупавалі ням. і тур. войскі. За Германіяй асталіся Рыжскі заліў з Маанзундскімі а-вамі. Расія абавязалася правесці дэмабілізацыю арміі і флоту, у т. л. і часцей Чырв. Арміі. Б. м. аднавіў нявыгадныя Расіі гандлёвыя тарыфы. 27.8.1918 у Берліне падпісана руска-герм. фінансавае пагадненне, паводле якога Сав. Расія абавязалася заплаціць кантрыбуцыю ў 6 млрд. марак. Умовы Б. м. не датычыліся карэнных заваёў Сав. улады. Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі скінула кайзера Вільгельма II, і 13.11.1918 Брэсцкі дагавор ануляваны.

Літ.: Ленін У. І. Да гісторыі пытання аб нягчасным міры, Тв., т. 26 (Поли. собр. соч., т. 35); Ягож. Сацыялістычная айчына ў небяспецы.— Мір ці вайна? — Даклад на пасяджэнні ВЦВК 23 лютага 1918.— Нягчасны мір, Тв., т. 27 (Поли. собр. соч., т. 35); Ягож. Сёмы з'езд РКП(б) 6—8 сакавіка 1918 г.— IV Надзвычайны Усерасійскі з'езд Саветаў 14—16 сакавіка 1918 г., Тв., т. 27 (Поли. собр. соч., т. 36); Документы внешней политики СССР, т. 1, М., 1957; Майоров С. М. Борьба Советской России за выход из империалистической войны, М., 1959; Починин С. З. В грозовом восемнадцатом, Мн., 1969. *С. З. Пачанін.* Мінск.

Мірныя перагаворы ў Брэсце. Сакавік 1918 г.




БРЭСЦКІ ПАДПОЛЬНЫ АБКОМ КП(б)Б у гады Вялікай Айчыннай вайны, цэнтр кіраўніцтва партыйным падполлем і партызанскім рухам на тэр. Брэсцкай вобл. ў час нямецка-фашысцкай акупацыі. Створаны паводле пастановы ЦК КП(б)Б у студз. 1943. Чл. абкома прыбылі на акупаваную тэр. ў сак. 1943, распачалі дзейнасць у канцы красавіка. Сакратары С. І. *Сікорскі* і І. І. *Баброў*, чл. бюро: А. М. Драздоў, В. Ф. Каліберaў, З. Ф. Паплаўскі, С. П. Пацяруха, Ф. Дз. Рома і А. І. Федасюк. Дру-

кованы орган газ. «Заря» (пач. мая 1943 — ліп. 1944), перыядычнасць 8 разоў на м-ц, тыраж 200—300 экз., рэд. Каліберaў). За час дзейнасці абком стварыў 2 міжрайкомы [гл. *Міжраённыя падпольныя камітэты КП(б)Б*], 10 райкомаў [гл. *Раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б*] і Брэсцкі гарком, якія ў 1943 аб'ядноўвалі 30 пярвічных парт. арганізацый, 780 чл. і канд. у чл. партыі. Для больш паспяховага разгортвання народнай барацьбы тэр. вобласці была падзелена на 3 міжраённыя кусты: Пружанскі (аб'ядноўваў Косаўскі, Ружанскі, Пружанскі, Шарашоўскі і Поразаўскі р-ны, узначальваў Пацяруха), Брэсцкі (аб'ядноўваў Брэсцкі, Дамачоўскі, Маларыцкі і Жабінкаўскі р-ны, узначальваў Паплаўскі), Кобрынскі (аб'ядноўваў Антопальскі, Дзівінскі і Кобрынскі р-ны, узначальвала Федасюк). За час існавання падпольнага абкома прынята ў партыю каля 500 чал.; выдадзена каля 25 назваў лістовак і адозваў, рэгулярна выходзілі бюлетэнь «Вести с Советской Родины», зводкі Саюзінфармбюро. 5 райкомаў і гарком выдавалі газеты. Пад кіраўніцтвам падпольнага абкома КП(б)Б дзейнічаў Брэсцкі падпольны абком ЛКСМБ (крас. 1943 — ліп. 1944, сакратары Ф. Дз. Рома і М. М. Лыжын), 18 падпольных райкомаў і Брэсцкі гарком ЛКСМБ, якія аб'ядноўвалі 353 пярвічныя арганізацыі, 3545 камсамольцаў. Абком партыі накіроўваў дзейнасць *Брэсцкага партызанскага злучэння, Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта.*

Літ.: Гл. пры арт. *Брэсцкая абласная партыйная арганізацыя.*

БРЭСЦКІ ПАНЧОШНЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства лёгкай прамысловасці. Буд-ва пачалося ў 1965. Асн. прадукцыя — мужч., жан. і дзіцячыя панчошна-шкарпэтачныя вырабы з сінт. ніцяў: гладкія, узорыстыя, аднатонныя і стракатавязаныя панчохі, шкарпэткі, калготы і гольфы з чыстага эластыку і ў спалучэнні з капронавым шоўкам, з чыстай або змешанай шэрсці. Выпускае таксама пражу — ніці эластыку на патрэбы свайго камбіната і інш. трыкатажных прадпрыемстваў. Першую прадукцыю — 814,5 тыс. пар панчошна-шкарпэтачных вырабаў і 395,4 *т* ніцяў эластыку камбінат выпусціў у канцы 1967. У 1969 выраб прадукцыі склаў адпаведна

Вязальны цэх.



18 137,7 тыс. пар і 1283,6 *т* ніцяў. Праектная магутнасць 30,6 млн. пар вырабаў і 1200 *т* пражы ў год. Асн. цэхі: круцільны (выраб пражы), вязальны, швейна-кецельны, фарбавальна-аддзелачны. Прадпр. аснашчана спецыялізаваным абсталяваннем: круцільнымі, трасцільнымі і мятальнымі машынамі для вырабу ніці, круглапанчошнымі аўтаматамі для вязання вырабаў, аднапрацэснымі аддзелачнымі аўтаматамі, якія спалучаюць тры аперацыі — афарбоўку, аддзелку і сушку. Працэс вырабу прадукцыі аўтаматычны і паўаўтаматычны. *В. В. Кузьмічоў.* Брэст.

БРЭСЦКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ імя А. С. Пушкіна, заснаваны 14.10.1950 у Брэсце на базе Брэсцкага настаўніцкага інстытута (існаваў з 1945). Рыхтуе выклад-




Будынак Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна.

чыкаў бел. мовы і л-ры, рус. мовы і л-ры, матэматыкі, фізікі, біялогіі і хіміі, геаграфіі і біялогіі, настаўнікаў пач. класаў, фіз. выхавання. Ф-ты ў 1969/70 навуч. г.: біёлага-хімічны, фізіка-матэм., геаграфа-біялагічны, мовы і л-ры, фіз. выхавання, падрыхтоўкі настаўнікаў пач. класаў. У 1969/70 навуч. г. займалася 4118 студэнтаў.

У 1970 на 19 кафедрах 186 выкладчыкаў, у т. л. 45 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Ін-т мае біёлага-геагр. станцыю, заалагічны і батанічны музеі, музей А. С. Пушкіна, б-ку. Пры ін-це навуч.-кансультацыйны пункт для студэнтаў-завочнікаў інш. ВНУ. Рэктар канд. гістар. н. Г. П. Андрэюк.


БРЭСЦКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на ПдЗ вобласці, каля дзярж. граніцы з ПНР. Пл. 1,6 тыс. *км²*. Нас. 40,9 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 12 сельсаветаў; г. п. Дамачова. Цэнтр Брэст.

Рэльеф раёна нізінна-раўнінны. На Пн — *Прыбугская раўніна* (выш. 150—180 *м*), якая на Пд паступова пераходзіць у нізіну *Брэсцкага Палесся* (выш. 140—150 *м*). Карысныя выкапні: 6 радовішчаў глін для вытворчасці цэглы, дрэнажных трубаў, чарапіцы, аглапарыту з агульнымі запасамі 21,1 млн. *м³* (у т. л. радовішчы Вычулкі — 10,4 млн. *м³*, Гершоны-Міцькі — 4,8 млн. *м³*, Трышын — 4,2 млн. *м³*); радовішча пясчана-жвіровага



матэрыялу Вільямовічы — 0,2 млн. *м³*. Сярэдняя т-ра студз. —4,1, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 538 *мм* за год. Вегет. перыяд 208 дзён. Гідраграфічная сетка даволі густая. Галоўная р. Буг з прытокамі Лясная, Мухавец, Прырва, Капаёўка і інш. Найбольшае гасп. значэнне мае Мухавец, які ўваходзіць у сістэму Дняпроўска-Бугскага воднага шляху. На Пд раёна значныя азёры: Сяляхі, Рагаянянскае, Белае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (47,3%), дзярнова-падзолістыя часова залішне ўвільготненыя (15,9%), тарфяна-балотныя (15%), дзярнова-глеяватыя (10,7%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (6,1%), дзярнова-глеевыя (5%). З мінер. глебаў 12,9% сугліністых, 60,7 супясчаных, 26,4% пясчаных.

Клуб саўгаса «Мухавец» на цэнтральнай сядзібе.



Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 41 (цана бала 0,26 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 29, усіх с.-г. угоддзяў 36. Пад лесам 1/3 тэр., асн. лясныя масівы на Пд раёна. Хвойныя (хвоя, елка) займаюць 72,4% пакрытай лесам плошчы; бяроза, асіна, вольха 23,9%; дуб, ясень, граб 3,7%. Насяляюць раён беларусы (97%), ёсць рускія, украінцы, палякі, яўрэі. Сярэдняя шчыльн. 26 чал. на 1 *км²*, у т. л. сельскага 24 чал. на 1 *км²*. Паліўная база раёна — торфапрадпр. «Блювініцкі», якое здабывае торф на Лышчыцкім, Блювініцкім і Тальмаўскім участках. У Дамачове прамкамбінат (чарапічны і мэблевы цэхі, млын). Прамысл. буд. м. (Чарнаўчыцкі палігон жалезабетонных канструкцый), раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Рыбная гасп. «Страдзеч». У 1970 у Б. р. было 14 калгасаў і 8 саўгасаў.

Калгасы і іх цэнтры: імя Гагарына *(Прыбарава)*, імя Дзяржынскага *(Камароўка)*, імя Жданава *(Паддубжжа)*, «За мір» *(Страдзеч)*, «Зара» *(Малыя Радванічы)*, «Іскра» *(Чарнаўчыцы)*, імя Калініна *(Скокі)*, «Краіна Саветаў» *(Церабунь)*, імя Леніна *(Вялікія Матыкалы)*, імя Мічурына *(Новыя Лышчыцы)*, «Пагранічнік» *(Клейнікі)*, «Памяць Ільіча» *(Астрамечава)*, «Расія» *(Вялікія Радванічы)*, «Савецкая Армія» *(Покры)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Брэсцкі» *(Тальмы)*, імя Гастэлы *(Сычы)*, «Дамачоўскі» *(Дамачова)*, «Маладая Гвардыя» *(Чэрні)*, «Мухавец» *(Мухавец)*, «Прыбужжа» *(Гершоны)*, «Світанне» *(Казловічы)*, «Сцяг» *(Знаменка)*.



Нарыхтоўка сіласу ў калгасе «Краіна Саветаў».

С. гасп. спецыялізуецца на вытворчасці малака, мяса, фабрычных цукр. буракоў. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 40% тэр. Асушаюцца балоты і забалочаныя землі. За пасляваенныя гады асушана 13,2 тыс. *га* (на пач. 1970). Агульная пасяўная пл. ў 1969 (тыс. *га*) — 42,1, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 19,4, тэхнічнымі (цукр. буракі, лён) 1,4, бульбай 6,9, пад кармавымі культурамі 13,9. Гадуюць пераважна буйн. раг. жывёлу і свіней. Гадоўля авечак і птушак мае падсобнае значэнне. На пач. 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 38,6 (у т. л. кароў 19,6), свіней 20,9, авечак 2,2. Транспарт чыгуначны і аўтамабільны. Гал. вузел чыгунак і шашэйных дарог Брэст. Чыг. магістралі Масква — Брэст, Кіеў — Брэст, веткі Брэст — Высокае і Брэст — Тамашоўка. Шашэйныя дарогі Масква — Брэст, Кіеў—Брэст, Брэст—Камянец. Брэст—

канцавы пункт *Дняпроўска-Бугскага канала*. У 1970 у раёне было 11 сярэдніх, 22 васьмігадовыя, 36 пачатковых, завочная і санаторна-лясная школы, 6 дашкольных устаноў, 47 клубных устаноў, 34 б-кі, 51 кінаўстаноўка, у т. л. 48 стацыянарных, 6 бальніц, 21 фельч.-ак. пункт. На пач. 1970 у раёне працавала 420 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, з іх 27 аграномаў, 17 заатэхнікаў і 13 вет. урачоў, 15 эканамістаў, 31 урач, 295 настаўнікаў і інш.; 584 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Заря над Бугом». На беразе Белага воз. турысцкая база.

М. У. Амельянчук. Брэст.

БРЭСЦКІ ЭЛЕКТРАЛЯМПАВЫ ЗАВОД, прадпрыемства электратэхнічнай прамысловасці. Выпускае нармальна-асвятляльныя электралямпы магутнасцю ад 15 да 200 *вт*,



Спіральна-электродны цэх.

напружаннем 127 і 220 *в* і спец. электралямпы (аўтамабільныя, трактарныя, камутатарныя і інш.). Праектная магутнасць з-да — 228 млн. лямпаў за год. Прадукцыю дае з 1966 (1,5 млн. лямпаў). У 1969 выраблена 114,3 млн. лямпаў: 16 тыпаразмераў, розных па магутнасці, велічыні светлавога патоку, тэрміну службы. Прадпр. аснашчана механізаванымі паточнымі лініямі для зборкі электралямпаў, гідраўлічнымі прэсамі для выразбу цокаляў камутатарных лямпаў, талерачнымі і колбавыдзімальнымі аўтаматамі для вырабу шклодэталяў і інш. спецыялізаваным абсталяваннем, якое забяспечвае паточны характар вытворчасці. У перспектыве буд-ва прафілакторыя.

М. М. Петухоў. Брэст.

БРЭСЦКІЯ ВЫСТУПЛЕННІ САЛДАТ 1905 і 1906, рэвалюцыйныя выступленні салдат гарнізона Брэсцкай крэпасці. Праходзілі пад кіраўніцтвам *Брэсцкай арганізацыі РСДРП* і *Брэсцкай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП*. Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі рота крапасной артылерыі на чале са старшым пісарам Аляксандравым 24.11.1905 арганізавала мітынг, на які прыбылі 7, 11, 12, 15-я і 16-я роты. Салдаты перадалі каменданту крэпасці прынятую на мітынгу рэзалюцыю з патрабаваннямі: вызваліць севастопальскіх і кранштацкіх рэвалюц. матросаў, якія адбывалі пакаранне ў Брэсцкай крэпасці, а таксама салдатаў-агітатараў Брэсцкага гарнізона; звольніць салдатаў звыштэрміновай службы; палепшыць умовы службы, харчы, абмундзіраванне і інш. Брэсцкая ваенна-рэвалюц. арг-цыя распаўсюдзіла ў крэпасці лістоўкі «Да ўсіх салдатаў Брэст-Літоўскага гарнізона» і «25 патрабаванняў салдатаў да начальства». Камандаванне вымушана было ўлічыць некат. патрабаванні — дэмабілізаваць салдатаў звыштэрміновай службы, палепшыць харчы, абмундзіраванне і інш. 5.12.1905 намочнік варшаўскага ген.-губернатара паведамляў у дэпартамент паліцыі, што настрой салдатаў Брэсцкага гарнізона ўзяты і патрэбны неадкладныя меры, каб не дапусціць падзей, падобных да кранштацкіх і севастопальскіх. Выступленні салдатаў-артылерыстаў не падтрымалі пяхотныя батальёны, і яно было задушана. 9—10.7.1906 у Брэсцкім гарнізоне адбылося выступленне салдатаў 2-га асаднага артыл. палка, якія патрабавалі вызваліць арыштаваных таварышаў, атрымліваць усе газеты, палепшыць матэрыяльнае становішча. Калі камандаванне пачало арышты, салдаты спалілі памяшканне лагернага афіцэрскага сходу, разграмілі салдацкую краму, паранілі некалькіх афіцэраў. Да рэвалюц. палка далучыліся інш. часці, аднак ім не ўдалося злучыцца з крапаснымі батальёнамі. Паўстанцы былі акружаны, ізаляваны ад салдатаў і рабочых. 700 удзельнікаў выступлення арыштаваны і пасаджаны ў крэпасць.

Літ.: Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955; Липинский Л. П. и Лукьянов Е. П. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900—1907 гг.), Мн., 1968.

М. Я. Шкляр. Мінск.

БРЭУСАЎ Сцяпан Ціханавіч [н. 3(16).1. 1904, с. Высокае Чымкенцкага пав. Сыр-Дар'інскай вобл.— 5.3.1963], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1945. На фронце з 1942. Ваяваў на Паўд.-Зах. і 1-м Прыбалт. франтах. Узвод, якім камандаваў Б., вызначыўся ў баях каля в. Казанова Віцебскага р-на. 23.6.1944 байцы ўварваліся ў траншэю ворага, знішчылі 4 станковыя кулямёты, захапілі гармату, узялі ў палон 22 гітлераўцаў. 25.6. 1944 узвод фарсіраваў Зах. Дзвіну па Пн3 ад Віцебска, захапіў плацдарм, знішчыў 2 кулямёты, гармату і адбіў 3 варожыя контратакі. Адна з вуліц у Высокім названа імем Б.

БРЭХТ (Brecht) Бертальд (10.2.1898, Аўгсбург — 14.8.1956), нямецкі пісьменнік і тэатральны дзеяч. З сям'і фабрыканта. Вывучаў л-ру, філасофію і медыцыну ў Мюнхенскім ун-це. У 1-ю сусв. вайну служыў санітарам у шпіталі. У час Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 чл. Аўгсбургскага салдацкага савета. У пач. 20-х г. займаўся тэатр. дзейнасцю ў Мюнхене, з 1926 у Берліне ў т-ры М. Рэйнгарта. Калі да ўлады прыйшоў Гітлер, Б. эмігрыраваў, з 1941 жыў у ЗША. У 1948 вярнуўся ў дэмакр. сектар Берліна, дзе заснаваў т-р «Берлінер ансамбль» (1949). Актыўна ўдзельнічаў у буд-ве сацыяліст. культуры ГДР. Літ. дзейнасць пачаў у 1914 антыбурж. і антымілітар. вершамі. У ранніх п'есах («Ваал», паст. 1923; «Што той салдат, што гэты», паст. 1926; «Трохграшовая опера», паст. 1928) сродкамі сатыры і гратэска выкрываў сац. хлусню пануючых класаў. Вывучэнне марксізма-ленінізма і збліжэнне з рэвалюц. рухам ням. пралетарыяту памаглі Б. стаць на пазіцыі сацыялісц. рэалізму, распрацаваць тэорыю «эпічнага тэатра». Асн. задачу тэатра бачыў у абуджанні рэвалюц. свядомасці мас. Напісаў рэаліст. драмы з глыбокім філас. зместам. У п'есе «Маці» (паст. 1932) паводле рамана М. Горкага Б. упершыню ўздымае тэму класавай барацьбы пралетарыяту. Карыстаючыся прыёмам пераасэнсавання традыц. сюжэтаў, сатырычна паказаў заганы бурж. грамадства ў п'есе «Святая Іагана бойняў» (1929—30, выд. 1932, паст. 1959), створанай па матывах «Арлеанскай дзевы» Ф. Шылера. Напярэдадні і ў пач. 2-й сусв. вайны працаваў над п'есамі «Матухна Кураж і яе дзеці» (нап. 1939, паст. 1941) і «Кар'ера Артура Уі» (нап. 1941, паст. 1958), дзе раскрыў сапраўдны твар мілітарызму і фашызму. Пра адказнасць вучонага перад чалавецтвам расказвае ў драме «Жыццё Галілея» (нап. 1938—39, паст. 1943). Бесчалавечнасць бурж. гр-ва ў цэнтры драмы «Добры чалавек з Сезуана» (паст. 1943). Аўтар апавяданняў, сатыр. анекдотаў, кн. «Трохграшовы раман» (1934) і незакончанага рамана «Справы пана Юлія Цэзара». Нац. прэмія ГДР (1951), Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1954. Рускі т-р БССР імя М. Горкага паставіў п'есу «Матухна Кураж і яе дзеці» (1962), т-р імя Я. Купалы — «Што той салдат, што гэты» (1968).

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Пярэднія выйшлі ў заўтра, Мн., 1968; рус. пер.— Театр, т. 1—5, М., 1963—65; Стихи. Роман. Новеллы. Публицистика, М., 1956.

Літ.: Фрадкин И. М. Бертольт Брехт. Путь и метод. М., 1965 (бібліягр.); Копелев Л. З. Брехт, М., 1966; Бертольд Брехт. Библиогр. указатель, М., 1969.

А. В. Карэльскі. Масква.

БРЭШКА-БРАШКОЎСКАЯ (дзявочае Вярыга) Кацярына Канстанцінаўна (1844, Чарнігаўская губ.— 1934), адна са стваральніц і лідэраў партыі эсэраў. Спрабавала арганізаваць узорную ферму ў маёнтку Гараны Віцебскай губ., які часткова ёй належаў. Двойчы, у 1874—96 і 1907—17, была на катарзе і ў ссылцы. У 1899 з А. В. Бонч-Асмалоўскім і Р. А. Гершуні стварыла ў Мінску «Рабочую партыю палітычнага вызвалення Расіі». Пасля разгрому гэтай партыі ў 1900—01 аб'ядноўвала ўцалелыя гурткі ў партыю



сацыялістаў-рэвалюцыянераў — эсэраў (1902). У 1917 адна з лідэраў правых эсэраў. Падтрымлівала бурж. Часовы ўрад. Кастр. рэвалюцыю сустрэла варожа. У 1918 чл. Камуча (Камітэт членаў Установучага сходу) — контррэвалюц. ўрада, створанага ў Самары. У 1919 эмігрыравала.

М. В. Віч. Мінск.

БУАЛО, Буало-Дэпрэо (Boileau-Despréaux) Нікала (1.11.1636, Парыж — 13.3. 1711), французскі паэт і крытык, тэарэтык класіцызму. Сын адваката. Літ. дзейнасць пачаў у 1666 сатырамі. У паэме «Паэтычнае мастацтва» (1674) сфармуляваў асн. прынцыпы франц. класіцызму. Эстэтыка Б. праяснута рацыяналізмам і нарматывізмам. На аснове вывучэння ант. л-ры імкнуўся вызначыць «спрадвечныя» законы мастацтва. Яго тэорыя жанраў — падзел іх на «высокія» (трагедыя, эпапея) і «нізкія» (камедыя, раман) — адпавядала саслоўнай іерархіі абсалютысцкага гр-ва. Адмоўна ставіўся да нар. паэзіі, асуджаў свабоду фантазіі і рэалізм эпохі Адраджэння. Паэтыка Б. зрабіла вялікі ўплыў на еўрап. л-ру класіцызму.

Тв.: Рус. пер.— Поэтическое искусство, М., 1957.

БУАНАРОЦІ (Buonarroti) Філіпа Мікеле (11.11.1761, Піза — 17.9.1837), французскі і італьянскі рэвалюцыянер, камуніст-утапіст, паплечнік Г. *Бабёфа* і прапагандыст яго ідэй. Удзельнік італьян. нац.-вызв. руху. У пач. франц. бурж. рэвалюцыі (1789) перабраўся на в-аў Корсіку. Падзяляў дэмакр. погляды якабінцаў. За рэвалюц. заслугі яму ў 1793 прысвоена франц. грамадзянства. Пасля контррэвалюц. перавароту 9 тэрмідора Б. арыштавалі (1795) і зняволілі. Пасля амністыі разам з Бабёфам удзельнічаў у руху «ў імя роўнасці», пазней зноў арыштаваны і прыгавораны (1797) да пажыццёвага зняволення, якое заменена ў 1800 ссылкаю. У Бруселі выдаў кнігу «Змова ў імя роўнасці» (1828; рус. пер. пад рэд. В. П. Волгіна, т. 1—2, 1948). К. Маркс і Ф. Энгельс высока цанілі кнігу, якая адыграла вялікую ролю ў распаўсюджванні камуніст. ідэй. Да канца жыцця не спыняў рэвалюц. дзейнасці.

БУБЕН, ударны музычны інструмент. Драўляны абруч, з аднаго боку абцягнуты скурай; у прарэзах абруча — латуневыя талерачкі, пад скураю падвешаны званочкі. Гучыць ад удараў далоні ці пальцаў па скуры і патрэсвання. У Еўропу завезены ў сярэднія вякі з усх. краін. З 19 ст. ўведзены ў сімф. аркестр. На Беларусі ўваходзіў у *традыцыйную музыку*.



БУБІН Станіслаў Францавіч (н. ў снеж. 1917, в. Бубны Дрысенскага пав. Віцебскай губ.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1939. Скончыў *Асобы Беларускі збор* па падрыхтоўцы партыз. кадраў (1942). З чэрв. 1942 у тыле ворага — камандзір партыз. атрада «Бясстрашны», які

да вер. 1943 дзейнічаў у Дрысенскім р-не Віцебскай вобл. З ліст. 1943 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Баранавіцкай*. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

БУБНАЎ Андрэй Сяргеевіч [парт. псеўд. Хімік, Якаў; 23.3(4.4).1883, Іванава-Вазнясенск — 12.1.1940], савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч. З мяшчан. Чл. КПСС з 1903. Удзельнік IV (1906) і V (1907) з'ездаў РСДРП. Выбраны канд. у чл. ЦК РСДРП(б) на VI парт. канферэнцыі (1912), чл. ЦК РСДРП(б) на VI з'ездзе партыі (1917), чл. ВРК і Парт. цэнтра па кіраўніцтве паўстаннем (кастр. 1917). З сак. 1918 у складзе Укр. сав. ўрада і ЦК КП(б)У, у 1919 чл. РВС Укр. фронту і 14-й арміі. У 1922—23 заг. агітпропа ЦК РКП(б), у 1925 сакратар ЦК РКП(б), у 1924—29 нач. Паліт. ўпраўлення Чырв. Арміі і чл. РВС СССР. З 1929 нарком асветы РСФСР. Аўтар прац па гісторыі партыі, народнай асвеце.



Літ.: Бриневич А. И. и Серебрянский З. Л. Андрей Бубнов, М., 1964.

БУБНАЎ Іван Рыгоравіч [6(18).1.1872—13.3.1919], рускі інжынер, заснавальнік будаўнічай механікі карабля. Праф. Політэхн. ін-та (1909) і Марской акадэміі (1910) у Пецярбурзе. У 1891 скончыў Марское інж. вучылішча ў Кранштаце, у 1896 Марскую акадэмію. Першы вывучыў дынаміку спуску судна са стапеля на ваду, абгрунтаваў пытанні мясцовай і агульнай трываласці суднаў, распрацаваў класіфікацыю разліковых нагрузак, якія дзейнічаюць на карабель і інш. Стварыў першую ў Расіі падводную лодку «Дэльфін» з рухавіком унутр. згарання (закладзена ў 1902 на Балтыйскім з-дзе).

Тв.: Избранные труды, Л., 1956; Труды по теории пластин, М., 1953.

БУБНЫ, вёска ў Валынецкім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., паміж рэкамі Дрыса і Свольна. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 35 *км* на ПдУ ад Верхнядзвінска, 184 *км* ад Віцебска, 1 *км* ад чыг. ст. Свольна. 71 ж., двароў 29 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БУБНЫ, вёска ў Ваўкалацкім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Бубны». За 64 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 30 *км* ад чыг. ст. Будслаў, 173 *км* ад Мінска. 235 ж., двароў 103 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

БУВІН Іван Іванавіч (1920, в. Сабораўка Кромскага пав. Арлоўскай губ. — ліст. 1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1939. На фронце з 1941. Вызначыўся ў баях каля в. Бахукалы Брэсцкага р-на 28.7.1944. Байцы артыл. батарэі, якою камандаваў Б., на шашы Жабінка — Брэст перарэзалі шлях адступлення ворагу і прамой наводкай знішчылі каля 500 гітлераўцаў, 3 гарматы, бронетранспарцёр і многа інш. ваен. тэхнікі. Загінуў у баі ў час вызвалення Польшчы.

БУГ (Заходні Буг), рака ў СССР і Польшчы (на працягу 420 *км* цячэ па граніцы), правы прыток Віслы. Даўж. 826 *км*, у межах СССР 604 *км* (у БССР 169 *км*). Уся пл. вадазбору 73 470 *км*², на тэр. СССР 20 500 *км*² (у БССР 10 400 *км*²). Пачынаецца на зах. схіле Падольскага ўзвышша, у Львоўскай вобл., цячэ па Люблінскай узгорыстай вобл. і Падляссі і ўпадае ў Віслу за 24 *км* ніжэй Варшавы. Шыр. даліны Б. 1—3,5 *км*. Рэчышча звілістае, шматрукаўнае, шыр. яго ад 10—20 *м* (у вярхоўі) да 50—80 *м*, мясцінамі 200—300 *м*. Гал. прытокі: злева — Рата, Салокія, Уладаўка, Кшна, справа — Мухавец, Лясная і Нараў. Дняпроўска-Бугскі канал злучае бас. Буга з Прыпяццю (бас. Дняпра), Аўгустоўскі канал — з бас. Нёмана. Ледастаў з 2-й паловы снежня да сярэдзіны сакавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 280 *м*³/*сек*. На Б. гарады Брэст і Сакаль. Суднаходны ніжэй Брэста.

БУГА (Būga) Казімерас (6.11.1879, в. Пажыегіе каля г. Зарасай — 2.12.1924), літоўскі моваznавец. Праф. Пермскага (1918), Томскага (1919) і Ковенскага (1922) ун-таў. Даследаваў слав.-балтыйскія моўныя сувязі (у т. л. літоўска-беларускія) і балт. міфалогію; запісваў фальклор; вывучаў літоўскія геагр. назвы і ўласныя імёны, узаемаадносіны літоўцаў і беларусаў («Літоўска-беларускія ўзаемаадносіны і іх старажытнасць», 1925). Сабраў вялікую картатэку (каля 500 000 картак), якая пакладзена ў аснову акад. слоўніка літоўскай мовы. Аўтар працы «Мова і старажытнасць» (1922).

Тв.: Rinktiniai raštai, t. 1—3, Vilnius, 1958—62.

БУГАЕЎ Дзмітрый Якаўлевіч (н. 12.1.1929, в. Сычык Магілёўскай акр.), беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1960), дац. БДУ. З сялян. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1952). Працаваў у Мазырскім пед. ін-це (1955—59), у Ін-це л-ры АН БССР (1959—64). Друкуецца з 1957. Станаўленне творчай індывідуальнасці пісьменніка, пытанні рамантызму, стылю — асноўнае, што цікавіць Б. як даследчыка. Сааўтар «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1—2, 1965—66).

Тв.: Шчодрае сэрца пісьменніка, Мн., 1963; Паэзія Максіма Танка, Мн., 1964; Уладзімір Дубоўка, Мн., 1965; Максім Гарэцкі, Мн., 1968; Шматграннасць, Мн., 1970.

Літ.: Рагойша В. П. (скл.) Працы кафедры беларускай літаратуры БДУ. Бібліягр. даведнік, Мн., 1968.

БУГАЕЎ Яўген Іосіфавіч [н. 28.11(11.12).1912, в. Красова Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], савецкі парт. дзеяч, гісторык, публіцыст. Канд. гістар. н. (1952). З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Маскоўскі ін-т гісторыі, філасофіі і л-ры імя Чарнышэўскага (1940), Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП(б) (1942). У 1930—40 настаўнік на Віцебшчыне. З 1942 на парт. рабоце. У 1948—49 першы сакратар Мінскага абкома КП(б)Б. Нам. гал. рэдактара час. «Партийная жизнь» (1954—56), нам. заг. аддзела час. «Проблемы мира и социализма» (1958—60), гал. рэдактар час. «Вопросы истории КПСС» (1960—61), час. «Партийная жизнь» (1961—66). З крас. 1966 нам. гал. рэдактара час. «Коммунист». Дэп. Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Советская Белоруссия к тридцатилетию Великой Октябрьской социалистической революции, Мн., 1947; Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии, М., 1959; Наша Ленинская партия, М., 1963; КПСС — организатор коммунистического строительства в СССР, М., 1967; О некоторых закономерностях развития КПСС, М., 1969; (у сааўт.) Основы политических знаний, М., 1963; (у сааўт.) Основы научного коммунизма, М., 1969; (у сааўт.) История Коммунистической партии Советского Союза, т. 3, кн. 1—2, М., 1967—68.

БУГАІ, птушкі атрада галянастых. Падзяляюцца на 2 роды: вялікія Б. (Botaurus) і малыя Б., або ваўчкі (Ixobrychus). Вялікія Б. (B. Stellaris) пашыраны ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. У БССР — звычайная пералётная птушка (нар. назвы: вадзяны бык, гібейла, бухала). Даўж. 60—80 *см*, маса каля 1,5 *кг*. Цела сплюшчанае з бакоў, дзюба роўная, вострая, ногі доўгія, апярэнне вохрыстае з цёмнымі плямкамі. Жыве на балотах. Хаваецца ў чаротавых зарасніках. Спосаб жыцця начны. Гняздуецца на купінах. Нясе 3—5 яец. Гучныя крыкі самцоў у гнездавы перыяд нагадваюць рыканне бугая (адсюль назва). Корміцца рыбай, жабамі, птушанятамі, вадзянымі насякомымі і інш. На Беларусі жыве таксама малы Б. (I. minutus), нар. назвы: малы бугайчык, лазняюга, гібялюйчык. Селіцца ў лазняках і ў чароце. Спосаб жыцця скрытны, пераважна начны. Нясе 3—7, нават 9 яец.



Вялікі бугай.

БУГЕ́РА — ЛА́МБЕРТА — БЭ́РА ЗАКО́Н, вызначае аслабленне паралельнага монахраматычнага пучка святла пры яго распаўсюджанні ў паглынальным рэчыве.

Адкрыты франц. вучоным П. Бугерам у 1729, падрабязна прааналізаваны нім. вучоным І. Г. Ламбертам у 1760 і праверaны эксперыментальна нім. вучоным А. Бэрам у 1852. Выражаецца формулай $I=I_0e^{-æcl}$, дзе I_0 і I — інтэнсіўнасці святла перад паглынальным слоем і пасля яго, l — таўшчыня слоя, $æ$ — паказчык паглынання святла ў разліку на адзінку канцэнтрацыі с рэчыва. Пры вялікіх I значная колькасць паглынальных часцінак пераходзіць ва ўзбуджаны стан і ва ўсіх рэальных квантавых сістэмах $æ$ залежыць ад інтэнсіўнасці святла. У гэтым выпадку Б.—Л.—Б. з. траціць сілу, а залежнасць I ад l знаходзяць з рашэння дыферэнцыяльнага ўраўнення $dI=-æ\,cIdl$, калі вядома залежнасць $æ$ ад інтэнсіўнасці. Б.—Л.—Б. з. вызначае і ўзмацненне святла ў актыўных асяроддзях ($æ<0$), калі $æ$ не залежыць ад I.

Літ.: Степанов Б. И. и Грибковский В. П. Введение в теорию люминесценции, Мн., 1963.

В. П. Грыбкоўскі. Мінск.

БУДА, 1) прадпрыемства, спецыяльна абсталяваная печ у лясах Беларусі 15—18 ст. для вытворчасці паташу, для смалакурэння, гонкі дзёгцю, выпальвання драўнянага вугалю і інш. 2) Лясны пасёлак, у якім жылі *буднікі*. З часам пасёлкі ператварыліся ў пастаянныя паселішчы, вёскі. Ад іх паходзяць шматлікія Б. як назвы бел. вёсак, найбольш пашыраныя ва Усх. Палессі. 3) Палатняны верх воза ці крыты воз.


БУДА (санскр. будха, літар. прасветлены ведамі; той, які зразумеў), у будыйскай рэлігіі назва вернастаўнікаў і тых, што пабыта дасягнулі найвышэйшай святасці. У будыйскім пантэоне налічваецца каля тысячы Б. Але найчасцей Б. наз. Сідхартху Гаўтаму, які паводле падання заснаваў *будызм*.

БУДА, вёска ў Пірагоўскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Смірнова. За 11 *км* на Пн ад Дуброўна, 83 *км* ад Віцебска, 2 *км* ад чыг. ст. Асінаўка, на шашы Мінск — Масква. 339 ж., гасп. 104 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад-яслі, аддз. сувязі, майстэрня быт. абслугоўвання. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 96 яе жыхароў. 2 помнікі — удзельнікам *Асінторфскага камсамольскага падполля* і 1865 сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

БУДАВЕ́СЦЬ, возера ў бас. Сечны, правага прытока Зах. Дзвіны, у Шумілінскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 3,18 *км*², найб. глыб. 11,2 *м*. На воз. 4 а-вы. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Схілы пераважна ўзвышаныя, найб. стромкія на З, тэрасаваныя, выкарыстоўваюцца пад ворыва або ўкрыты хмызняком. Дно складанай будовы, услана крамянзёмістымі сапрапелямі. Вадазбор (19,9 *км*²) дробнаўзгорысты і раўнінны. Воз. эўтрофнага тыпу, зарастае, шыр. палосы трыснягу і чароту 30—50 *м*. Б. на Пн злучаецца пратокай з воз. Лескавічы, на Пд праз ручай з воз. Сасна. Багатае на рыбу; водзяцца верхаводка, акунь, шчупак, лешч, плотка, лінь.

БУДАВЕ́СЦЬ, рака, левы прыток Обалі (бас. Зах. Дзвіны). У верхнім цячэнні наз. Будавіца. Даўж. 23 *км*. Цячэ па Полацкай нізіне ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл. Пл. вадазбору 284 *км*². Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

БУДА́Й Генадзь Васілевіч (н. 26.6.1918, мяст. Койданава Мінскай губ.), адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобл. ў Вялікую Айчынную вайну. Засл. дз. культ. БССР (1968). З служачых. Чл. КПСС з 1946. Скончыў БДУ (1959). У 1934—38 супрацоўнік раённай газеты ў Дзяржынску. У 1938—41 студэнт Камуністычнага ін-та журналістыкі ў Мінску. У Айч. вайну чл. *Дзяржынскага антыфашысцкага камітэта*, рэдактар газ. Івянецкага падпольнага райкома «Народный мститель», а з сак. 1944 газ. Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б «Чырвоная звязда». У 1944—46 в. а. рэдактара, у 1946—54 нам. рэдактара



Буда-Кашалёва. Тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі.

баранавіцкай абл. газ. «Чырвоная звязда»; у 1954—57 адказны сакратар, у 1957—59 нам. рэдактара рэсп. газ. «Калгасная праўда». З 1959 нам. гал. рэдактара час. «Коммунист Белоруссии». Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

БУДАП Ядвіга Іосіфаўна (н. 15.5.1922, в. Строчыца Мінскага пав.), перадавік с.-г. вытворчасці. Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1959. З 1937 у калгасе «Чырвоны агароднік», з 1952 даярка калгаса «Савецкая Беларусь» Мінскага р-на.

БУДА-КАШАЛЁВА, гар. пас. (з 1938), цэнтр Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. За 48 *км* на ПнЗ ад Гомеля. Чыг. ст. на лініі Мінск — Гомель. 7,2 тыс. ж. (1969).

Узнік у сувязі з буд-вам у 1873 Ліпава-Роменскай чыг. каля в. Кашалёва. У 1887 Б.-К. станцыя III класа Ліпава-Роменскай чыг. У 1888 заснавана прадпрыемства, якое вырабляла драўляныя дэталі ткацкіх станкоў. Помнікі ўраджэнцам Б.-К. двойчы Герою Сав. Саюза ген.-м. П. Я. *Галавачову* і віцэ-адміралу В. П. *Дразду*.


Масласырзавод, хлебазавод, пладова-агародніннымі з-д; камбінаты: буд. м. і быт. абслугоўвання; лясгас, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Міжкалгасбуд. Тэхнікум механізацыі с. гасп.; школы — 2 сярэднія, рабочай моладзі, музычная, дзіцячая спарт., дзіцячы сад-яслі, Дом піянераў, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на ПнУ вобласці на левабярэжжы Дняпра. Пл. 1,6 тыс. км². Нас. 73,5 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 21 сельсавет; 2 гар. пас.: Буда-Кашалёва (цэнтр р-на), Уваравічы.

Паверхня раёна — плоская раўніна, якая паступова павышаецца на ПнУ, дзе рэльеф больш расчлянёны. Сярэдняя выш. 130—150 *м*, на ПнУ 140—170 *м* над узр. м. Пераважаюць водна-ледавіковыя пясчана-гліністы адклады, ледавіковыя валунныя суглінкі і супескі. Карысныя выкапні: радовішча торфу Кабылянскае — 5,8 млн. *т*; 9 радовішчаў цагельных глін і суглінкаў — 6,8 млн. *м*³ (у т. л. радовішчы Зара — 4,3 млн. *м*³ і Елянец — 1,7 млн. *м*³). Сярэдняя т-ра студз. ад —6,5 да —7, ліп. 18,5—19 °С. Ападкаў 560 *мм* за год. Вегет. перыяд 195 дзён. Рэкі: на З — Дняпро, на У — правыя прытокі Сажа — Уза, Ліпа і Чачора. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (50,4%, з іх 13,9% аглеенныя знізу), дзярнова-падзолістыя глеяватыя і глеевыя (27,5%), дзярновыя глеяватыя і глеевыя (15,3%), тарфяна-балотныя (6,7%). З мінер. глебаў 50% сугліністых, 34,9 супясчаных, 15,1% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 48 (цана бала 0,26 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 26, усіх с.-г. угоддзяў 40. Пад лесам 21% тэр. Лясы мяшаныя, шырока вядомыя дубровы. Насельніцтва — беларусы (98,2%), рускія і інш. Сярэдняя шчыльн. 46 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 16%.

Прадпрыемствы: маслазавод, пладова-агароднінны з-д; камбінаты буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання ў Буда-Кашалёве; ільнозавод, агароднінасушыльны з-д, камбінат быт. абслугоўвання ў Уваравічах; спіртзавод у в. Рагінь. У раёне 15 калгасаў, 12 саўгасаў, эксперым. база (1970).

Калгасы і іх цэнтры: «Авангард» (*Старая Буда*), імя Горкага (*Іванаўка*), «Зара» (*Ліпічы*), «Іскра» (*Забалоцце*), імя Калініна (*Івольск*), імя Леніна (*Новая Гусляніца*), «Новае





Птушкаферма саўгаса «Камунар».


жыццё» (*Глазаўка*), «Перамога» (*Елянец*), «Прагрэс» (*Недзяўка*), імя Ульянава (*Буда-Люшаўская*), імя Чапаева (*Крыўск*), «Чырвоная зорка» (*Хойхла*), імя Энгельса (*Губічы*), «Чырвоны шлях» (*Бацунь*), «Юбілейны» (*Негайка*). Саўгасы і іх цэнтры: «Буда-Кашалёўскі» (*Буда-Кашалёва*), «Дзярбічы» (*Дзярбічы*), «Камінтэрн» (*Шыроkае*), «Камунар» (*Камунар*), «Маразавічы» (*Маразавічы*), «Патапаўскі» (*Патапаўка*), «Рагінь», (*Рагінь*), «Чабатовічы» (*Чабатовічы*), «Чачора» (*Саўгасная*), «Чырвонакастрычніцкі» (*Акцябр*), «Шарыбаўскі» (*Шарыбаўка*), «Шлях Ільіча» (*Міхалаўка*). Эксперымент. база Гомельскай абл. с.-г. станцыі — «Уваравічы» (*Уваравічы*).

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і вырошчванні бульбы, лёну. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 65% тэр. раёна. Асушана 14,4 тыс. *га* (на пач. 1970) балотаў і забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) склала 71,7, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 31,3, бульбай 12,2, тэхнічнымі (лён-даўгунец) 2,9, кармавымі культурамі 24,8. На пач. 1970 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 57,5, у т. л. кароў 28,2; свіней 41,2, авечак і коз 3,5. Тэр. раёна перасякаюць чыгунка Мінск — Гомель і шаша Бабруйск — Гомель.

На пач. 1970 у раёне было 17 сярэдніх, 28 васьмігадовых, 45 пачатковых, 2 школы рабочай і сельскай моладзі, 11 дзіцячых дашкольных устаноў, 35 масавых б-к, 41 клубная ўстанова, 41 кінаўстаноўка, у т. л. 28 стацыянарных, 7 бальніц, 36 фельч.-ак. пунктаў. На 1.1.1970 у раёне працавала 655 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 21 інжынер, 48 аграномаў, 24 заатэхнікі, 18 вет. урачоў, 49 урачоў, 363 настаўнікі; 1436 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Авангард».

С. А. Польскі. Мінск.

Уборка збажыны ў саўгасе «Дзярбічы».



БУДА-ЛЮШАЎСКАЯ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Ульянава. За 19 *км* на ПнЗ ад Буда-Кашалёва, 60 *км* ад Гомеля, 8 *км* ад чыг. ст. Салтанаўка. 461 ж., двароў 145 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

БУДАН, часовая пабудова, вартоўня і склад у садах, на вялікіх агародах, у лесе. Па форме двухсхільны дах на слупах, злучаных перакладзінай. Б. накрываюць саломай, карой або галлём.

БУДАПЕШТ (Budapest), сталіца Венгерскай Народнай Рэспублікі. Размешчаны ў цэнтр. частцы краіны. Дунай падзяляе горад на 2 часткі: на правым беразе — Буда, на левым — Пешт. Вузел аўтамаб. дарог і 10 чыгунак. Найб. рачны порт краіны. Міжнар. аэрапорт. 1989 тыс. ж. (1968). Б. вылучаны ў самастойную адм. адзінку на правах вобласці (медзье).

Б. утварыўся ў 1872 у выніку аб'яднання двух самастойных гарадоў — Буды і Пешта. На месцы Буды ў старажытнасці было паселішча кельтаў, у 1—4 ст. рым. паселішча Аквінк. На тэр. Пешта да 10 ст. існавалі слав. паселішчы. У 1361 Буда стала сталіцай венг. каралеўства. У 1541—1686



Будапешт. Від з гары Гелерт.

Буда і Пешт пад уладаю турка. З пач. 18 ст. у складзе імперыі Габсбургаў. Горад адыграў важную ролю ў рэвалюцыі 1848—49. З канца 19 ст. В.— цэнтр рабочага рэвалюц. руху. У сак. 1944 акупаваны гітлер. войскамі. 13.2.1945 вызвалены Сав. Арміяй.

Б. дае каля 50% прамысл. прадукцыі краіны, тут сканцэнтравана каля 40% прамысл. рабочых Венгрыі. Найб. развіты выплаўка чорных і каляровых металаў, вытв. пракату, выраб трубаў, хім. прамысловасць, транспартнае, с.-г. і эл.-тэхн. машынабудаванне, прылада- і станкабудаванне. Прадпрыемствы харч., швейнай, абутковай, мэблевай, фармацэўтычнай, тэкст., мукамольнай, кандытарскай, кансервавай прамысловасці. Найб. прадпр.— машынна-металургічны камбінат «Чэпель».

Гарыстую Буду і раўнінны, рэгулярна спланаваны Пешт звязваюць 8 мастоў (у т. л. «Ланцхід», 1839—49, інж. У. Т. Кларк і інш.). У Будзе збераглісяархітэктурны ансамбль «Крапасной гары» (13—17 ст.), гатычная ц. Божай маці (13—15 ст., 19 ст.), жылыя дамы ў стылі барока і інш. У 1947 на гары Гелерт у знак удзячнасці венг. народа Сав. Арміі збудаваны манумент Вызвалення

(скульптар Ж. Кішфалудзі-Штробль). Сярод збудаванняў Пешта: парламент (1884—1904, арх. І. Штэйндль), Нац. музей (1837—47, арх. М. Полак), Оперны т-р (1875—84, арх. М. Ібль), помнік 1000-годдзя Венгрыі (1894—1929, скульптар Дз. Зала), Народны стадыён (1948—53, арх. К. Давід і інш.), Дом прафсаюза работнікаў буд. прамысловасці (1948—49, арх. Л. Гадараш, І. Перэні і інш.), жылыя дамы на пл. Ударнікаў (1949—50, арх. І. Шалаі і інш.), гасцініца «Будапешт» (1967—68). Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Венгрыя*.

У Б. Венгерская АН (з 1840) з шэрагам НДІ. 15 ВНУ; найважнейшыя: політэхн. і мед. ін-ты, 3 ун-ты (імя Л. Этвеша, палітыка-эканамічны імя К. Маркса, с.-г. навук). Сярод 16 музеяў: выяўл. мастацтваў, прыкладнога мастацтва, нар. мастацтва і этнаграфіі, Венг. нац. галерэя. З 16 тэатраў найб. вядомыя Нацыянальны і Оперны.

Літ.: Геллерт Д. Будапешт, пер. с венг., М., 1959; Чилляк Г. Мы сражались в Будапеште, пер. с венг., М., 1966.

БУДАПЕШЦКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944—45, наступальная аперацыя войск 2-га і 3-га Украінскіх франтоў 29.10.1944—17.2.1945 у Венгрыі ў Вял. Айч. вайну.

Абароне Будапешцкага ўмацаванага раёна нямфаш. камандаванне надавала асаблівае значэнне, бо ён прыкрываў подступы да Вены і Паўд. Германіі. На подступах да Будапешта праціўнік стварыў тры моцныя абарончыя палосы. Тут дзейнічалі 43 ням. дывізіі (у т. л. 8 танкавых і 1 кавалерыйская) і 3 брыгады. Войскі 2-га Укр. фронту (Маршал Сав. Саюза Р. Я. *Маліноўскі*) з 29 кастр. ў цяжкіх баях прарвалі абарону праціўніка і да 9 снеж. выйшлі да знешняга абарончага абводу Будапешта. Войскі 3-га Укр. фронту (Маршал Сав. Саюза Ф. І. *Талбухін*) пачалі наступленне 7 ліст., фарсіравалі Дунай і да 9 снеж. выйшлі на Пн ад воз. Веленцэ і да воз. Балатан, пагражаючы тылам варожай групоўкі. 20 снеж. пачалося агульнае наступленне сав. войск. 26 снеж. будапешцкая групоўка ворага ў 180 тыс. чал. была акружана. Каб пазбегнуць лішніх ахвяр і разбурэння Будапешта, сав. камандаванне прапанавала ёй капітуляваць. Ультыматум быў адхілены, а сав. парламенцёры забіты. Каб вызваліць акружаныя дывізіі і адвабіць абарону на Дунаі (гл. *Балатонская аперацыя 1945*), у студз. ням.-фаш. камандаванне спрабавала арганізаваць контрнаступленне. На асобных участках фронту праціўнік пранік у абарону сав. войск і выйшаў да Дуная. Сав. войскі, адбіўшы жорсткія атакі ворага, 27 студз. перайшлі ў наступленне, 13 лют. вызвалілі Будапешт і ліквідавалі акружаную групоўку. У складзе сав. войск дзейнічалі румынскія і балгарскія баявыя злучэнні. У ходзе Б. а. сав. войскі знішчылі больш за 20 дывізій праціўніка, забяспечылі спрыяльныя ўмовы для наступлення на Вену і Паўд. Германію. Створаны 22 снеж. Часовы нац. ўрад Венгрыі 28 снеж. абвясціў вайну фаш. Германіі. Апошні саюзнік Германіі ў Еўропе — Венгрыя — быў выведзены з вайны.


Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза, 1941—1945, т. 4, М., 1962, с. 390—408; Шлемин И. Т. Историческая роль Советской Армии в освобождении Венгрии от фашистского ига. «Доклады и сообщения Ин-та истории АН СССР». 1955, в. 7; Смирнов С. В боях за Будапешт, 2 изд., М., 1949; Немеш Д. Освобождение Венгрии, пер. с венг., М., 1957.

М. Я. Стральцоў.

БУДА-САФІЕЎКА, вёска ў Буйнавіцкім с/с Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 28 км на ПнУ ад Лельчыц, 187 км ад Гомеля, 39 км ад чыг. ст. Ельск. 624 ж., двароў 188 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддзяленне сувязі, магазін.

БУДАЎНІЦТВА, 1) галіна народнай гаспадаркі па стварэнні, рэканструкцыі і расшырэнні асноўных фондаў — прамысловых прадпрыемстваў, электрастанцый, чыгуначных і аўтамабільных дарог, ліній электрапередач і сувязі, жыллёвых, адміністрацыйных, камунальных, культурна-бытавых і іншых пабудоў, якія забяспечваюць вытворчую дзейнасць людзей і іх матэрыяльна-культурныя патрэбы. 2) Працэс будаўніцтва аб'екта, будоўля. 3) Аб'ект разам з адведзенай тэр. для выканання будаўніча-мантажных работ. Як галіне нар. гасп. Б. належыць найважнейшая роля ў расшыраным сацыяліст. узнаўленні і стварэнні мат.-тэхн. базы камунізма. На долю Б. прыпадае каля $^1/_{10}$ усяго сукупнага грамадскага прадукту і нац. даходу краіны. Паводле прызначэння і асаблівасцей будавання розных аб'ектаў адрозніваюць наст. віды Б.: прамысловае, жыллёва-грамадзянскае, гідратэхнічнае, транспартнае, сельскагаспадарчае, інж. камунікацый і інш.

Як і ўся прамысловасць, Б. ў дарэвалюц. Беларусі было на нізкім тэхн. узроўні. Адразу ж пасля вызвалення Беларусі ад акупантаў і белагвардзейцаў СНК РСФСР разгледзеў пытанне пра дапамогу бел. народу і асігнаваў сродкі на аднаўленне прадпрыемстваў, жылых дамоў, бальніц, культ. устаноў. У 1925—26 у рэспубліцы капітальна адрамантавана і ўведзена ў дзеянне 80 прамысловых прадпрыемстваў. Пазней выраслі Бабруйскі дрэваапр. камбінат, Гомельскі з-д с.-г. машын, БелДРЭС і інш. Жыллёвым, грамадзянскім і прамысл. буд-вам кіраваў Камітэт дзярж. збудаванняў пры Саўнаргасе БССР. У 1926 арганізаваны рэспубліканскі трэст Белдзяржбуд з сеткай буд. кантор у Мінску, Магілёве, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Оршы і інш. гарадах, рэарганізаваны ў Белбудаб'яднанне, а ў 1930 — у Белдзяржбудтрэст. Адначасова закладваліся асновы спецыялізацыі буд. арг-цый. Былі створаны таксама трэсты Белкамунбыт і Мінбуд. Б. пераводзілася на індустр. аснову. Спрыяла гэтаму вытворчасць будаўнічых і дарожных машын, якая стваралася ў СССР і павышала ўзровень механізацыі Б., садзейнічала развіццю прамысл. буд. матэрыялаў (гл. *Будаўнічае, дарожнае і камунальнае машынабудаванне, Будаўнічых матэрыялаў прамысловасць*). Адначасова стваралася сістэма падрадных буд.-мантажных арг-цый — аснова *будаўнічай індустрыі*. У 1-й пяцігодцы (1928—32) пабудавана больш за 500 прадпр. Усяго за перыяд даваенных пяцігодак у БССР пабудавана больш як 1700 прамысл. прадпр., насельніцтва з 1919 да 1941 атрымала кватэр на 12 056 тыс. м² агульнай (карыснай) пл. Аднаўляліся і будаваліся новыя чыгункі, шашэйныя дарогі, асушаліся землі, раслі калгасы, саўгасы. У Айч. вайну большасць збудаванняў разбураны (гл. *Акупацыйны рэжым*). Аднаўляць нар. гасп. БССР памагалі ўсе сав. рэспублікі. Былі створаны Мін-ва жыллёва-грамадзянскага буд-ва, Галоўнае ўпраўленне прамысл. буд-ва (Галоўпрамбуд) і Галоўнае ўпраўленне па аднаўленні Мінска (Галоўмінскбуд). З 1944



Будаўніцтва олеумнага цэха Гродзенскага азотнатукавага завода.

да 1950 дзярж. капіталаўкладанні па Беларусі ў 1,4 раза перавысілі ўзровень усіх даваенных пяцігодак. Толькі ў 1951—55 уведзена ў строй 147 буйных прадпр. Усяго пасля вайны адноўлена і пабудавана больш за 700 прамысл. прадпр. З'явіліся сусв. вядомыя гіганты індустрыі: Мінскі трактарны з-д, Мінскі і Беларускі аўтамаб. заводы, Полацкі нафтаперапр. з-д, Першы і Другі Салігорскія камбінаты і інш. Будуюцца (1970) Беларускі шынны камбінат, Магілёўскі камбінат сінт. валакна, Мазырскі нафтаперапр. з-д, Трэці Салігорскі камбінат і інш. прадпр. Пабудаваны новыя прамысл. цэнтры Салігорск, Светлагорск, Жодзіна, Наваполацк, Белааверск. Хуткія тэмпы і эфектыўнасць прамысл. буд-ва дасягнуты за кошт высокага ўзроўню індустрыялізацыі буд. вытворчасці і развітай прамысловасці буд. матэрыялаў. У БССР у 1968, напр., выраб зборных бетонных і жалезабетонных канструкцый і дэталяў у 3,2 раза перавысіў узровень 1960. Высокай эфектыўнасці спрыяе таксама шырокае буд-ва прамысл. комплексаў у БССР: група прадпр. горада будуецца паводле адзінага плана з адзінай сістэмай камунікацый. Такія комплексы створаны ў Брэсце і Віцебску, ствараюцца ў Маладзечне, Магілёве, Пінску, Мазыры, Барысаве і інш. гарадах. Яны прыкладна на 10—15% змяншаюць затраты і значна скарачаюць тэрміны буд-ва.

Многа сродкаў адпускаецца на жыллёвае буд-ва. Пасля вайны да 1969 у БССР за сродкі дзяржавы, калгасаў і насельніцтва здадзена ў эксплуатацыю дамоў на 62 млн. 972 тыс. м² агульнай (карыснай) плошчы, у 1969 86 тыс. новых кватэр і індывідуальных жылых дамоў на 4 млн. 155 тыс. м² агульнай (карыснай) пл. У 1969 перасяліліся ў новыя дамы, а таксама палепшылі жыл. ўмовы звыш 400 тыс. чал. Першы буйнапанельны дом пабудаваны ў 1959. У 1968 выраблена панеляў на 678,1 тыс. м² жыл. пл. У рэспубліцы працуе 8 домабуд. камбінатаў, у т. л. камбінат аб'ёмнага домабудавання магутнасцю 100 тыс. м² жылой пл. ў год. Аб'ём паўнавзорнага жыллёвага буд-ва дасягнуў прыкладна 42%. Пачалася карэнная перабудова вёсак. Паводле перспектыўнага плана замест шматлікіх дробных населеных пунктаў прадугледжваецца стварыць каля 6 тыс. пасёлкаў гар. тыпу. Пераважная большасць вызначаных для перспектыўнага развіцця вёсак забяспечана ген. планамі забудовы. У кожнай вобласці створаны эксперымент. гаспадаркі для паказу новых праектаў жылых дамоў і культ.-быт. устаноў, новых буд. м. і індустр. метадаў буд-ва. Для дапамогі ў забудове вёсак і кантролю за ажыццяўленнем ген. планаў у райвыканкомах уведзена пасада архітэктара раёна. У новых пасёлках з улікам асаблівасцей сельскага жыцця будуюцца дамы з усімі камунальнымі выгодамі, комплексам культ.-быт. прадпр. для сялян. Добраўпарадкаваныя пасёлкі ствараюцца ў калгасах «Прагрэс» Гродзенскага, «Гвардыя» Бераставіцкага, «Новы быт» Мінскага, імя Калініна Нясвіжскага, «Аснежыцкі» Пінскага, імя Кірава Слуцкага р-наў і ў многіх інш. Вялікія сродкі ідуць на культ.-быт. і інш. грамадзянскае Б. У 1966—68 у БССР толькі за кошт дзярж. сродкаў пабудавана 365 агульна-

Будаўніча-меліярацыйныя работы ў вярхоўі ракі Морач Мінскай вобласці.



адук. школ, дзіцячых дашкольных устаноў на 41,8 тыс. месцаў, бальніц і паліклінік на 4176 ложкаў і г. д.

Ажыццяўляецца шырокая праграма меліярац. буд-ва. На пач. 1969 у БССР было 1360,8 тыс. *га* асушаных зямель. Праведзены вялікія работы па тэхн. пераўзбраенні Беларускай чыгункі і буд-ве аўтамаб. дарог. Даўжыня апошніх (з цвёрдым пакрыццём) у 1968 перавысіла ўзровень 1940 больш чым удвая. Павялічваецца таксама аб'ём с.-г. буд-ва. У 1968, напр., пабудавана 420 збожжасховішчаў, 1312 памяшканняў для жывёлы і птушак, 213 майстэрняў і шмат інш. вытв. будынкаў.

Рост капіталаўкладанняў дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў і арганізацый БССР (без калгасаў, млн. руб., у супастаўных цэнах)

	Усяго ў народную гаспадарку	У тым ліку			
		прамысловасць	сельская гаспадарка	транспарт	жыл. буд-ва
Усяго за 1919—68	13 797	4777	1889	1569	2173
1919—28 (без 4-га кв. 1928)	33	4	3	16	5
1-я пяцігодка (1928—32)	129	22	17	67	8
2-я пяцігодка (1933—37)	203	48	24	73	20
3-я пяцігодка (1938—1-е паўгоддзе 1941)	346	55	15	102	32
1944—45	145	19	5	66	17
4-я пяцігодка (1946—50)	775	237	57	162	126
5-я пяцігодка (1951—55)	1254	397	168	145	228
1956—60	2348	758	325	201	453
1961—65	4427	1584	647	430	656
1966	1199	471	164	94	184
1968	1547	630	252	111	229
1969	1734	687	309	120	256

У 1968 аб'ём капіталаўкладанняў быў у 1,2 раза большы, чым за ўсю 5-ю пяцігодку (гл. табл.). У БССР Б. ажыццяўляюць Мін-ва прамысл. буд-ва, Мін-ва сельскага буд-ва, Мін-ва мантажных і спец. буд. работ, Мін-ва меліярацыі і воднай гаспадаркі, а таксама многія спецыялізаваныя ўпраўленні і трэсты. Кантроль і тэхн. палітыку ў будаўніцтве ажыццяўляе Дзярж. камітэт Савета Міністраў БССР па справах буд-ва, якому падпарадкаваны Бел. дзярж. праектны ін-т, Бел. дзярж. ін-т прамысл. праектавання, Бел. дзярж. ін-т сельскага праектавання, Бел. дзярж. ін-т інж. разведак, НДІ буд-ва і архітэктуры і інш. Кадры для Б. рыхтуюць у БССР 3 ВНУ, 19 сярэдніх навуч. устаноў, 38 дзярж. прафесійна-тэхн. вучылішчаў.

У дарэвалюц. Расіі Б. не мела развітай матэрыяльнай базы. Мала выпускалася буд. матэрыялаў, адсутнічала механізацыя буд. і мантажных работ. Толькі ў канцы 19 ст. на будоўлях з'явіліся паравыя экскаватары. На маш.-буд. з-дах выпускаліся метал. канструкцыі для мастоў на чыгунках. Б. пераважна выконвалася прыватнымі падрадчыкамі, якія наймалі для гэтага сялян-адыходнікаў. Тэмпы Б. стрымлівала сезоннасць работ. У першыя гады Сав. улады ў краіне пачаліся адначуленне і рэканструкцыя разбураных вайной аб'ектаў і буд-ва новых. У 1918—28 паводле плана ГОЭЛРО пабудаваны Кашырская, Шатурская імя Леніна, Волхаўская і інш. раённыя электрастанцыі. Уступілі ў строй буйныя з-ды: Маскоўскі пражэктарны, ленінградскі «Электраприлада», Яраслаўскі маторны, Балахнінскі цэлюлозна-папяровы камбінат і інш. За гады даваенных пяцігодак у СССР уведзена ў строй 18 тыс. прадпр. Усяго пры Сав. уладзе пабудавана і адноўлена больш за 40 тыс. буйных прамысл. прадпрыемстваў, у т. л. Магнітагорскі, Кузнецкі, Орска-Халілаўскі металург. камбінаты, Запарожскі, Чарапавецкі, Карагандзінскі і Ліпецкі металург. з-ды, Нявіннамыскі, Шчэцінскі, Новамаскоўскі хім. камбінаты, Уральскі і Краматорскі з-ды цяжкага машынабудавання, Харкаўскі, Сталінградскі трактарныя, Маскоўскі, Горкаўскі аўтамаб. з-ды і інш. прадпрыемствы. З'явілася больш за 3 тыс. новых гарадоў і гар. пасёлкаў, сярод іх найб. прамысл. і культ. цэнтры: Магнітагорск, Новакузнецк, Камсамольск-на-Амуры, Нарыльск, Ангарск, Брацк, Краматорск, Сумгаіт. З 1918 да 1968 пабудавана дамоў на 2 млрд. 226,1 млн. м² агульнай (карыснай) пл.

У 1968 у параўнанні з 1961 капіталаўкладанні ў СССР павялічыліся ў 1,6 раза. Па тэмпах іх росту СССР апярэджвае ЗША, ФРГ і інш. развітыя капіталіст. краіны. Гл. таксама *Паточнае будаўніцтва, Аб'ёмна-блочнае будаўніцтва, Будаўніча-фінансавы план, Будаўнічая механіка, Будаўнічая фізіка, Будаўнічыя матэрыялы, Будаўнічыя машыны, Будбанк СССР, Архітэктура.* Іл. гл. па ўкл.

Літ.: Строительство в СССР. 1917—1967, М., 1967; Хачатуров Т. С. Капитальное строительство в СССР, М., 1967; Каменскі У. Г. Будаўніцтва ў БССР, Мн., 1957; Міронаў І. У. і Жаўнерчык А. І. Капітальнае будаўніцтва ў Беларускай ССР у сямігодцы, Мн., 1959; Прогрессивные методы жилищного строительства в Белоруссии, Мн., 1965; Зеньков И. С. и Русаков М. Я. Экономика строительства, М., 1967; Хачатрянц И. Т. Организация и управление строительным производством, Мн., 1967; Дронов Ф. А. и Караваев В. П. Эффективность капитальных вложений в строительстве, Мн., 1968; Организация работы по улучшению технико-экономических показателей на стройках Белоруссии, Киев, 1967; Источник высокой рентабельности. Опыт экономической работы в Минском ордена Ленина тресте № 5, Мн., 1968; Божко Г. К. Труд и заработная плата в строительстве Польской Народной Республики, М., 1969; Васильева О. П. Труд и заработная плата в строительстве США, М., 1968.

У. Г. Каменскі. Мінск.

БУДАЎНІЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва, распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя пытанні будаўніцтва і архітэктуры, тэхнічнай дапамогі будоўлям рэспублікі. Да 1963 ін-т знаходзіўся ў сістэме АН БССР. Засн. ў 1957 на базе арх.-будаўнічага сектара АН БССР, арганізаванага ў 1949. Дырэктар ін-та д-р тэхн. н. С. С. Атаеў. Лабараторыі: заводскага домабудавання; буд. цеплафізікі загараджальных канструкцый; сельскіх будынкаў і абудаванняў; фіз. асноў тэхналогіі бетону; жалезабетонных і шклопластабетонных канструкцый; патурных выпрабаванняў канструкцый; канструкцый буйнаэлементных будынкаў; механікі грунтоў, асноў і фундаментаў; буд. механікі армабетонных трубаправодаў, прасторавых канструкцый. Сектары: планіроўкі і забудовы гарадоў; ландшафтнай архітэктуры; раённай планіроўкі; эканомікі вытворчасці жалезабетонных канструкцый; эканомікі капітальнага буд-ва; інфармацыі і каардынацыі н.-д. работ. Ін-т мае навук.-эксперымент. базу. Асн. кірункі даследаванняў: горадабудаўніцтва і архітэктура; эканоміка буд-ва; фіз. асновы тэхналогіі бетону; тэхналогія вырабу жалезабетонных трубаў; канструкцыі буйнаэлементных будынкаў і тэхналогія іх вырабу; шклопластыкавая арматура і канструкцыі з шклопластыкаў; механіка грунтоў, асноў і фундаментаў. Каардынуе н.-д. работы ВНУ, навук. устаноў і праектных арг-цый БССР у галіне буд-ва і архітэктуры. Есць аспірантура. Выдадзены працы: «Механізацыя работ у сучасным жыллёвым будаўніцтве» С. С. Атаева (1960), «Разлікі асноў і фундаментаў» Я. Ф. Вінакурава (1960), «Высокатрывалы бетон» І. М. Ахвердава (1961), «Будаўнічыя ўласцівасці тарфяных грунтоў» Ф. П. Вінакурава, А. Я. Цяцёркіна і М. А. Пітэрмана (1962), «Мікраграфія Беларусі» (калект. праца, 1963), «Індустрыяльныя буйнапамерныя канструкцыі з цэглы» Д. Я. Канстанцінопускага, У. І. Скрыба (1963), «Галоўная вуліца Мінска» А. В. Лысенкі (1963), «Выкарыстанне шклопластыкаў для арміравання бетонных канструкцый» (калект. праца, 1964), «Праектаванне і будаўніцтва жыллёвых і грамадскіх будынкаў у Беларусі» Т. С. Страмцовай (1965), «Новыя гарады Беларусі» (калект. праца, 1966), «Тэхналогія і эканоміка аб'ёмна-блочнага домабудаўніцтва» С. С. Атаева, М. П. Блешчыка (1967), «Архітэктура і планіроўка малых гарадоў Беларусі» Н. А. Зэльтэн (1968), «Горадабудаўнічая эфектыўнасць і бяспека руху» А. Я. Кудравіцкага, Р. Н. Кудрашова (1969) і інш.

С. С. Атаеў. Мінск.

БУДАЎНІЧАЕ, ДАРОЖНАЕ І КАМУНАЛЬНАЕ МАШЫНАБУДАВАННЕ, галіна прамысловасці, якая выпускае машыны і абсталяванне для розных відаў будаўніцтва, а таксама для вытворчасці буд. матэрыялаў, лесанарыхтоўчай, тарфяной прамысловасці і камунальнай гаспадаркі. Асн. віды прадукцыі: экскаватары, скрэперы, бульдозеры, аўтагрэйдэры, краны, снегапагрузчыкі і снегаачышчальнікі, падымальныя ліфты, тэхнал. абсталяванне для сілікатнай, керамічнай, цэментнай прамысл. і вытворчасці жалезабетону, кандыцыянеры, пажарныя машыны, машыны для ачысткі вуліц і дарог — усяго больш за 3 тыс. тыпаразмераў машын і абсталявання.

На Беларусі атрымала развіццё пры Сав. уладзе. Напярэдадні Айч. вайны выпускаліся тарфяныя і меліярацыйныя машыны і буд. механізмы. Пасля вайны *мінскі завод «Ударнік»*, які раней вырабляў вагі, гіры, замкі і інш. вырабы, асвоіў выпуск дарожных і меліярацыйных машын і вырас у буйное спецыялізаванае прадпр. па вытворчасці пагрузчыкаў сыпкіх матэрыялаў, снегаачышчальных машын, бульдозераў, свідравальна-кранавых машын для ўстаноўкі апор, пракладкі ліній сувязі. З-д выпускае больш за 3 тыс. машын слмі назваў. *Магілёўскі завод «Строммашына»* стаў вядучым у СССР па выпуску аўтаматызаваных ліній і машын для вытв. азбацэментавых труб (даўж. да 6 *м*) і лістоў, шклоруберойду і інш. гідраізаляцыйных матэрыялаў. Вырабляе таксама абсталяванне для вытв. цэглы і электракерамікі, а з 1965 — і пасажырскія ліфты грузападымальнасцю да 500 *кг*. *Магілёўскі аўтамабільны завод* імя Кірава Мін-ва аўтамаб. прамысл. СССР выпускае маставыя эл. краны, самаходныя скрэперы, а таксама цягачы, якія ўваходзяць у камплект некат. буд. і дарожных машын. На *Магырскім заводзе меліярацыйных машын* наладжана вытворчасць канавакапальнікаў, канаваачышчальнікаў, карчавальнікаў, кратадрэнажных машын. Машыны і абсталяванне для тарфяной прамысл. выпускае спецыялізаваны *Гомельскі завод тарфянога машынабудавання*. Здадзена ў эксплуатацыю (1969) першая чарга *Магілёўскага ліфтабудаўнічага завода*: выпускае ўдасканаленыя пасажырскія ліфты для вышынных будынкаў. Усяго ў БССР (1969) выпушчана 2484 ліфты, 1064 скрэперы, 928 бульдозераў, 1449 снегаачышчальнікаў і пагрузчыкаў і шмат інш. прадукцыі. Аб'ём вытворчасці гэтай галіны ў 1968 павялічыўся ў параўнанні з 1960 у 2 разы. Далейшае развіццё Б., д. і к. м. ў БССР ажыццяўляецца шляхам рэканструкцыі старых і буд-ва новых з-даў на аснове паглыбленай спецыялізацыі і кааперавання вытворчасці.

У СССР вытворчасць экскаватараў, скрэпераў, бульдозераў, кранаў і інш. буд. машын пачалася у 1-й пяцігодцы (1928—32). Да 1940 у Каўрове, Кіеве, Крамянчузе, Рыбінску, Чэлябінску, Адэсе і інш. гарадах было пабудавана 25 спецыялізаваных з-даў, якія выпускалі 195 тыпаразмераў буд. і дарожных машын. У пасляваенны перыяд пабудаваны новыя прадпрыемствы Б., д. і к. м. Найбуйнейшыя з іх — «Волгацэмент», а таксама заводы ў Іванаве, Камышыне, Арле, Бранску, Вільнюсе, Даўгаўпілсе. Мін-ва Б., д. і к. м. аб'ядноўвае больш за 150 з-даў. На аб'ёме вытворчасці будаўнічых, дарожных, камунальных машын і абсталявання СССР уступае толькі ЗША, а па выпуску экскаватараў, скрэпераў, бульдозераў, вежавых кранаў (гл. табл.), машын для вытворчасці цэменту і жалезабетону займае 1-е месца ў свеце.

Вытворчасць асноўных відаў прадукцыі будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання СССР (у штуках)

	1940	1950	1960	1968
Экскаватары	274	3540	12 589	26 953
Скрэперы	2104	2089	3094	8336
Бульдозеры	118	3788	12 850	29 831
Аўтагрэйдэры	—	33	3135	4020
Краны на аўтамаб. ходзе	139	4152	6344	13 805
Краны вежавыя	57	1199	2826	3653
Ліфты	513	466	3365	13 712

Літ.: Строительное, дорожное и коммунальное машиностроение в СССР, т. 1—2, М., 1967; Строительные машины. Справочник, 3 изд., М., 1965; Строительные и дорожные машины. Автомобили. Краткое содержание докладов XXVII научной конференции ЛИСИ, Л., 1969; Машины для производства строительных материалов, М., 1969; Домбровский Н. Г. Экскаваторы, М., 1969.

М. М. Іпа. Мінск.

БУДАЎНІЧА-МАНТАЖНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, вытворчае падраздзяленне ў будаўніцтве, якое на аснове падраднага дагавору выконвае для заказчыка будаўніча-мантажныя работы. У сукупнасці Б.-м. а. — аснова *будаўнічай індустрыі.*

Паводле свайго прававога і эканам. становішча і ролі ў вытв. працэсе падзяляюцца на трэсты і плрвічныя Б.-м. а. Да плрвічных належаць буд. і мантажныя ўпраўленні, домабуд. камбінаты, перасоўныя мех. калоны, буд. цягнікі, міжкалгасныя буд. арг-цыі, якія маюць гасп.-аператыўную самастойнасць і права юрыдычнай асобы, выдзелены на самастойны баланс, распрацоўваюць *будаўнічафінансавы план.* У плрвічных Б.-м. а. ствараюцца буд. (прарабскія) участкі. Работамі на адным аб'екце кіруюць майстры. У склад буд. трэста ўваходзіць некалькі буд. упраўленняў, а таксама транспартная, складская, тэхн.-камунальная гаспадаркі, упраўленне механізацыі, вытв. прадпрыемствы і інш. У адносінах да іх трэст з'яўляецца органам распарадчага кіравання: ажыццяўляе вытворча-гасп. і фін. дзейнасць, аператыўна-вытворчае планаванне буд-ва, забяспечвае мат.-тэхн. сродкамі. Трэст узгадняе таксама тытульныя спісы будоўляў, заключае падрадныя дагаворы з заказчыкамі, ажыццяўляе падбор і падрыхтоўку кадраў, культ.-быт. абслугоўванне будаўнікоў. У залежнасці ад характару работ Б.-м. а. падзяляюцца на агульнабудаўнічыя і спецыялізаваныя (напр., сантэхнічных, электрамантажных, аддзелачных работ). Паводле адносін з заказчыкам падзяляюцца на генпадрадныя і субпадрадныя.

У 1969 у БССР было 580 буд. і мантажных, 69 рамонтна-буд., 13 кааператыўных і 124 каап.-калгасныя плрвічныя буд. арг-цыі, якія выканалі 94% агульнага аб'ёму буд.-мантажных работ. Астатні аб'ём работ выкананы *гаспадарчым спосабам будаўніцтва.* На пач. 1970 у БССР спецыялізавана больш за 70% Б.-м. а. Арганізацыйна Б.-м. а. ўваходзяць у склад мін-ваў і ведамстваў. Напр., у сістэме мін-ва прамысл. буд-ва 22 агульнабуд. і 3 спецыялізаваныя трэсты, 8 домабуд. камбінатаў. Сярэднегадавы (1969) аб'ём іх работ 17,8 млн. руб., на 4 млн. руб. больш, чым у 1968. У сістэме мін-ва сельскага буд-ва 11 агульнабудаўнічых і 1 спецыялізаваны трэст. Эфектыўнай формай Б.-м. а. ў сельскай мясцовасці сталі перасоўныя механіз. калоны (88 у 1969). Акрамя іх, у сельскай мясцовасці працуюць 124 міжкалгасныя буд. арг-цыі, якімі кіруе рэсп. аб'яднанне міжкалгасных буд. арг-цый.

Літ.: Курс экономики строительства, М., 1967; Законодательство о капитальном строительстве, в. 2, М., 1969.

М. В. Міронаў, Г. К. Чарняўскі. Мінск.

БУДАЎНІЧА-ФІНАНСАВЫ ПЛАН, комплекс планавых паказчыкаў вытворчай, гаспадарчай і фінансавай дзейнасці будаўнічай арг-цыі на год. Распрацоўваецца арг-цыяй, якая знаходзіцца на самастойным балансе і мае гадавы аб'ём буд.-мантажных работ на суму больш за 0,5 млн. руб. (буд. арг-цыі з аб'ёмам работ менш за 0,5 млн. руб. складаюць планы тэхн. развіцця і арганізацыйна-тэхн. мерапрыемстваў). Мэта Б.-ф. п. — найб. поўнае выкарыстанне рэзерваў, рост прадукцыйнасці працы і павышэнне рэнтабельнасці вытворчасці.

Асн. раздзелы Б.-ф. п.: праграма работ з перакам аб'ектаў буд-ва, тэрмінаў уводу іх у дзеянне, размеркаваннем аб'ёмаў работ па аб'ектах і выканаўцах; план павышэння эфектыўнасці вытворчасці, які прадугледжвае ўдасканаленне тэхнікі і тэхналогіі буд. вытворчасці, механізацыю работ, укараненне навук. арг-цыі працы; план забеспячэння буд. матэрыяламі, канструкцыямі, дэталямі і паўфабрыкатамі; план па працы і заработнай плаце; каштарыс выдаткаў на вытворчасць і план зніжэння сабекошту буд.-мантажных работ; план па фондах эканам. стымулявання; фінансавы план. *М. І. Прыкшайціс.* Мінск.


БУДАЎНІЧАЯ ІНДУСТРЫЯ, сукупнасць будаўнічых і мантажных арганізацый, якія маюць кадры кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў, матэрыяльна-тэхнічную і вытворчую базу для ажыццяўлення будаўнічай вытворчасці індустрыяльнымі метадамі. Аснова буд-ва. У БССР створана пры Сав. уладзе, забяспечвае высокія тэмпы і эфектыўнасць буд. работ. У 1968 на буд.-мантажных работах і ў падсобнай буд. вытворчасці працавала 244,5 тыс. чал., на 47,7 тыс. чал. больш, чым у 1965. За гэты перыяд колькасць спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыяй павялічылася на 56,1%. Першы экскаватар на будоўлях рэспублікі з'явіўся ў 1935, вежавы кран — у 1939, аўтакран — у 1940. За 1965—68 парк экскаватараў у буд-ве павялічыўся ў 1,5 раза, скрэпераў і бульдозераў у 2 разы, перасоўных кранаў у 2,5 раза (гл. табл.). За гэты час механаўзброенасць працы ў буд-ве выраслa ў 1,4, а энергаўзброенасць у 1,7 раза.

Колькасць будаўнічых машын у БССР (штук)

Гады	Экскаватары	Скрэперы	Бульдозеры	Краны перасоўн.	Аўтамабілі-грузчыкі	Аўтагрэйдары
1957	546	128	410	595	94	38
1960	1619	475	1438	901	149	109
1965	2713	228	1885	1794	195	140
1969	4476	478	3339	3345	314	236

Гал. ролю ў павышэнні ўзроўню індустрыялізацыі буд-ва адыграла вытв. зборных жалезабетонных і бетонных канструкцый і дэталяў. У БССР (1968) іх выпушчана 2552,7 м³, у 3,2 раза больш, чым у 1960. Аб'ём паўназборнага прамысл. буд-ва ў 1969 дасягнуў 31%, а жыл. і культ.-быт. 48%. У выніку хуткага развіцця Б. і. прадукцыйнасць працы ў будаўніцтве БССР за 1965—68 выраслa на 20,6%, намнога павысілася эфектыўнасць капітальных укладанняў.


У БССР (1969) жалезабетонныя і бетонныя канструкцыі і дэталі выраблялі 77 камбінатаў і з-даў, 200 цэхаў і палігонаў, сярод якіх найбольшыя: Аршанскі камбінат жалезабетонных канструкцый, Баранавіцкі камбінат жалезабетонных канструкцый, Брэсцкі з-д жалезабетонных вырабаў № 8, Бабруйскі з-д жалезабетонных вырабаў № 2, Віцебскі з-д жалезабетонных вырабаў № 3, Гродзенскі з-д жалезабетонных вырабаў № 10, Магілёўскі з-д жалезабетонных вырабаў



Буйная рагатая жывёла. 1. Кастрамская парода. 2. Бурая латвійская парода. 3. Сіментальская парода. 4. Чорна-пярэстая парода. 5. Швіцкая парода. 6. Чырвоная беларуская пародная група. 7. Сычоўская парода. 8. Шартгорнская парода малочна-мяснога кірунку. 9. Галандская парода.



1




2


Будаўніцтва. 1. Будаўніцтва 3-га Салігорскага камбіната. 2. Будаўніцтва мікрараёна па вуліцы Адоеўскага ў Мінску. 3. Мантаж металаканструкцый парнікова-цяплічнага камбіната ў саўгасе «Рудакова» Віцебскай вобласці. 4. На будаўніцтве нафтаправода «Дружба». 5. Будаўніча-мантажныя работы на Лукомльскай ДРЭС. 6. Будаўніцтва ўчастка параксілолу на Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе. 7. Будаўніцтва ў вёсцы Верцялішкі Гродзенскага раёна.




3



4



5



6



7

№ 4, Мінскі з-д жалезабетонных вырабаў № 1, Мінскі з-д жалезабетонных вырабаў № 5, Салігорскі з-д жалезабетонных вырабаў № 6, Светлагорскі з-д жалезабетонных канструкцый № 11.

СССР па вытв. зборнага жалезабетону займае 1-е месца ў свеце. Гл. таксама *Будаўнічамантажная арганізацыя*, *Будаўніцтва*, *Домабудаўнічы камбінат*.

Літ.: Краснов И. Д. Экономика строительной индустрии СССР, 2 изд., М., 1960; Строительная индустрия Белорусской ССР за 50 лет, Мн., 1969.

У. Г. Еўтух. Мінск.

БУДАЎНІЧАЯ МЕХАНІКА, навука пра метады разліку збудаванняў на трываласць, пруткасць і ўстойлівасць. Цесна звязана з супраціўленнем матэрыялаў, тэорыяй пругкасці і тэорыяй пластычнасці, а таксама з тэарэт. механікай. Асн. задачы Б. м.: вызначэнне ўнутраных намаганняў, якія ўзнікаюць у буд. канструкцыях пад дзеяннем нагрузак, змены т-ры і інш.; вызначэнне дэфармацый і вывучэнне ўмоў устойлівасці. Найб. складаным з'яўляецца разлік статычнавызначальных, статычна-невызначальных, а таксама плоскіх і прасторавых сістэм. Адрозніваюць Б. м. карабля і Б. м. самалёта. Б. м. ўзнікла на базе прац Г. Галілея, Л. Эйлера, Ж. Лагранжа, а таксама рус. і сав. вучоных Дз. І. Жураўскага, У. Р. Шухава, М. С. Стралецкага, В. З. Уласава, Б. Р. Галёркіна.

Літ.: Безухов Н. И. Основы теории упругости, пластичности и ползучести, 2 изд., М., 1968.

БУДАЎНІЧАЯ ФІЗІКА, навука, якая вывучае фізічныя працэсы будаўніцтва і эксплуатацыі будынкаў і збудаванняў. Падзяляецца на буд. цеплатэхніку, акустыку, святлотэхніку, кліматалогію, устойлівасць канструкцый.

Будаўнічая цеплатэхніка вывучае працэсы пераносу цеплыні і вільгаці; з яе дапамогай разлічваюць цеплаахоўную якасць агараджальных канструкцый, якія павінны забяспечыць пэўны тэмпературны рэжым і гігіенічныя ўмовы ў памяшканнях. Будаўнічая акустыка вывучае з'явы і працэсы распаўсюджання і затухання гуку ў агараджальных канструкцыях, будынках. Яе гал. задача — разлік гукаізаляцыі, каб панізіць шум у памяшканнях. Уваходзіць састаўной часткай у *акустыку архітэктурна-будаўнічую*. Будаўнічая святлотэхніка вывучае пытанні атрымання, выкарыстання і размеркавання светлавой энергіі для стварэння спрыяльных умоў бачнасці. Асн. задача: разлік асветлення і асветленасці прадметаў і паверхняў. Будаўнічая кліматалогія даследуе ўздзеянне клімату на будынкі і памяшканні. Будаўнічая ўстойлівасць канструкцый вывучае доўгачасовае супраціўленне канструкцый, вырабаў і матэрыялаў паступоваму разбурэнню, якое выклікаецца фізіка-кліматычным і фізіка-хімічным уздзеяннем навакольнага асяроддзя, вывучае метады павышэння ўстойлівасці сцен і фундаментаў.

Літ.: Строительная физика. Состояние и перспективы развития, М., 1961; Лыков А. В. Теоретические основы строительной теплофизики, Мн., 1961.

Ю. А. Фінаеў. Мінск.

БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ МІНСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў СССР, распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя пытанні атрымання эфектыўных буд. матэрыялаў на аснове мясцовых сыравінных рэсурсаў, павелічэння прадпрыемствамі выпуску прадукцыі і павышэння яе якасці. Арганізаваны ў вер. 1939 у Мінску на базе секцый буд. керамікі і вяжучых матэрыялаў Бел. НДІ прамысловасці (засн. ў 1929). Дырэктар ін-та канд. тэхн. н. І. Л. Чорны (з 1953). Лабараторыі: буд. керамікі; аглапарыту; аўтаклаўных матэрыялаў; лёгкіх бетонаў; вяжучых матэрыялаў; буд. пластмас; цеплаізаляцыйных матэрыялаў; фізіка-хіміі сілікатаў; цеплатэхнікі; хіміка-аналітычных даследаванняў; цеплафізікі; кантрольна-вымяральнай апаратуры і аўтаматыкі. Аддзелы: эканам. даследаванняў; навук. арг-цыі працы; навукова-тэхн. інфармацыі; канструктарскі. Пры ін-це ёсць доследна-эксперымент. прадпрыемства па вытв. новых буд. матэрыялаў. Асн. даследаванні: тэхналогія вытв. з гліністай сыравіны штучнага порыстага запаўняльніка (аглапарыту); буд. вырабаў і канструкцый на аснове аглапарыту, буд. керамікі і мясцовых вяжучых матэрыялаў. Выдадзены працы: 14 навук. зборнікаў (з 1950 да 1967); «Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў да 40-годдзя Беларускай ССР» І. М. Тарасава, І. Л. Чорнага, У. І. Купашкевіча, Ф. С. Сурмы (1958); «Калектыўныя формы аплаты працы за канчатковую прадукцыю» Ш. П. Дубшана, Я. Я. Русінава (1962); «Вызначэнне цеплафіз. уласцівасцей буд. матэрыялаў» А. Дз. Дзмітровіча (1963); «Вытворчасць ванны з рыхлага мелу ў БССР» Л. С. Куніцкага, С. М. Савіцкага, Г. К. Сіманжэнкавай, І. Р. Нігерыша (1968).

І. Л. Чорны. Мінск.

БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна цяжкай індустрыі па вытворчасці матэрыялаў і дэталяў для розных відаў будаўніцтва. Асн. галіны Б. м. п. — цэментная, азбестацэментная, жалезабетонная, буд. керамікі, сценавых, дахавых, гідра- і цеплаізаляцыйных матэрыялаў, порыстых запаўняльнікаў, мясцовых вяжучых матэрыялаў, буд. шкла.

Дарэвалюц. Беларусь мела некалькі невялікіх цагельных, чарапічных, кафляных з-даў і Ваўкавыскі цэментны завод. За гады даваен. пяцігодак пабудаваны Крычаўскі цэментны з-д, Гомельскі шклозавод імя Ламаносава, 2 з-ды сілікатнай цэглы (Клімавічы, Орша), ваннавыя з-ды, вял. цагельні ў Віцебску, Гомелі, Магілёве і г. д. У 1940 удз. вага Б. м. п. БССР у валавой прадукцыі прамысл. буд. м. СССР склала 2,1%. У Айч. вайну амаль уся Б. м. п. БССР знішчана. Пасля вайны адноўлены разбураныя і створаны новыя прадпр. на базе мясц. сыравіны. Вытв. буд. м. пераважна сканцэнтравана ў сістэме Мін-ва прамысл. буд. матэрыялаў БССР.

У 1970 было 31 прадпрыемства, з іх найбольшыя: Мінскі камбінат буд. м. (мінер. вата і вырабы з яе, керамічная абліцовачная плітка, цэгла), Мінскі цагельны з-д № 2 (цэгла, аглапарыт), Мінскі камбінат буйнаблочных буд. канструкцый (цэгла, гіпсабетонныя, вогнеўстойлівыя сілікатнабетонныя панелі, полісцірольны пенапласт), Гродзенскі камбінат буд. м. (цэгла, блокі і панелі з цвёрдага сілікату, ванны), Віцебскі камбінат буд. м. (цэгла, дрэнажныя трубы, керамзіт), *Крычаўскі цэментна-шыферны камбінат*, *Ваўкавыскі цэментны завод*, *Гомельскі шклозавод* імя Ламаносава. Акрамя таго, 230 цагельных з-даў (выпускаюць каля 60% будаўнічай цэглы) у сістэме Мін-ва мясцовай прамысловасці. Каб павысіць тэхн. ўзровень вытв. і паляпшыць якасць прадукцыі, у рэспубліцы створана сетка

НДІ і праектных устаноў: *будаўнічых матэрыялаў Мінскі навукова-даследчы інстытут; будаўніцтва і архітэктуры навукова-даследчы інстытут*; праектна-тэхн. ін-т Мін-ва мясцовай прамысл. БССР; трэст пусканаладачных, праектна-канструктарскіх работ і навук. арг-цыі працы Мін-ва прамысл. буд. матэрыялаў БССР, а таксама кафедры ў некат. ВНУ і базавыя лабараторыі прадпрыемстваў. Імі распрацаваны і выкарыстоўваюцца ў вытворчасці новыя буд. м.: буйныя сілікатныя блокі, мінералватныя плиты, гіпсабетонныя перагародачныя плиты і панелі, керамічныя абліцовачныя плиткі і цэгла, аглапарыт, керамзіт, полісіпольны пенапласт, ільнокастрычныя цеплаізаляцыйныя плиты і інш. Павялічваецца выпуск сінт. палімерных матэрыялаў на аддзелачныя работы, цепла- і гукаізаляцыю будынкаў і іншыя мэты. У 1968 удзельная вага Б. м. п. БССР у валавой прадукцыі гэтай галіны СССР склала 4,6%, або ўдвая больш, чым у 1940. Будуюцца (1970) магутныя з-ды па выт. дрэнажных трубаў (Маладзечна, Брэст, Гарынь) і кардону-руберойду (Асіповічы).

Вытворчасць асноўных відаў будаўнічых матэрыялаў у БССР

	Адзінка вымярэння	Гады				
		1913	1940	1958	1965	1969
Цэмент	тыс. *т*	33,0	199,6	539,5	1748,0	1918,0
Цэгла будаўнічая	млн. шт.	58,0	295,0	1141,8	1398,0	1773,5
Сценавыя буйныя бетонныя і сілікатныя блокі	тыс. шт. умоўнай цэглы	—	—	7774	37 645	46 498
Вапна будаўнічая і тэхналагічная	тыс. *т*	—	56,0	230,4	348,0	379,2
Гіпс будаўнічы	тыс. *т*	—	—	100,4	147,0	165,0
Мінеральная вата і вырабы з яе	тыс. $м^3$	—	—	126,0	466,8	719,3
Мяккае дахавае пакрыцці	млн. $м^2$	—	0,78	14,7	30,9	31,7
Шыфер азбестацэментны	млн. шт. умоўных плітак	—	—	83,6	129,3	163,9
Керамзіт	тыс. $м^3$	—	—	—	246,0	470,7
Шкло аконнае	млн. $м^2$	1,75	1,96	10,66	14,6	14,9

Б. м. п. шырока развіта ў ГДР, Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі, сярод капіталіст. краін — у ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Японіі, Італіі.

Літ.: Промышленность строительных материалов СССР. 1917—1967, М., 1967; Богуславский А. И. Основные направления развития промышленности строительных материалов в новой пятилетке (1966—1970), М., 1967; Томашевич А. В., Куркина З. А. и Грушевский В. М. Минерально-сырьевая база промышленности строительных материалов БССР, Мн., 1968; Купашкевич В. И. Технический прогресс в промышленности строительных материалов БССР, Мн., 1967; Логинов З. И. Экономические проблемы цементной промышленности СССР, М., 1967; Технико-экономические показатели промышленности строительных материалов зарубежных стран, М., 1966.

К. І. Бялай, Х. Д. Левін. Мінск.

БУДАЎНІЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, прыродныя і штучныя, арганічныя і неарганічныя (мінеральныя) матэрыялы, якія ўжываюцца для ўзвядзення будынкаў і збудаванняў. Сыравіна для вытворчасці Б. м. на Беларусі — горныя пароды *(вапняк, граніт, даламіт, гліна, пясок, мел)*, матэрыялы раслінага паходжання *(драўніна, торф)*, прадукты хім. і нафтаперапр. прамысловасці. Паводле прызначэння Б. м. падзяляюцца на сценавыя, дахавыя, цеплаізаляцыйныя, аддзелачныя і абліцовачныя (гл. адпаведныя артыкулы). Адрозніваюць таксама паводле матэрыялу і тэхналогіі іх вырабу асобныя групы Б. м. Да іх належаць драўляныя і муровачныя матэрыялы. На выраб бетонаў, растворaў, цеплаізаляцыйных пліт ідуць *вяжучыя матэрыялы*. На аснове *бітумаў* і дзёгцю атрымліваюць бітумінозныя матэрыялы. Да Б. м. належаць нізкавуглярадзістыя сталі (высокатрывалая арматура для жалезабетонных вырабаў), шэры чыгун (радыятары ацяплення), свінец (зачаканка стыкаў трубаў), сплавы алюмінію (пераплёты). Гл. таксама *Будаўнічых матэрыялаў прамысловасць*.

Літ.: Гл. пры арт. *Будаўнічых матэрыялаў прамысловасць*.

М. А. Шаліма. Мінск.

БУДАЎНІЧЫЯ МАШЫНЫ, машыны для выканання будаўнічых работ. Падзяляюцца на грузападымальныя (*краны*, падымальнікі), транспартавальныя (канвееры, канатныя дарогі), пагрузачна-разгрузачныя (*пагрузчыкі*); машыны для земляных *(экскаватары, бульдозеры, грэйдэры, скрэперы, гідраманіторы)* і буравых работ (бурыльныя станкі); для палявых работ (*капары*, вібрамолаты); для мех. апрацоўкі каменных матэрыялаў *(драбілкі)*; для гатавання бетоннай сумесі і растворaў (*бетонамяшалкі*, растворапомпы); для аддзелачных работ і інш. У залежнасці ад хадавой часткі Б. м. падзяляюцца на самаходныя, прычапныя, стацыянарныя. Сілавым абсталяваннем у Б. м. бываюць: эл. рухавікі; рухавікі ўнутр. згарання; пнеўматычныя, гідраўлічныя і камбінаваныя. Прадпрыемствы БССР выпрабляюць самаходныя скрэперы, бульдозеры, цягачы, пагрузчыкі, канавакапальнікі, помпы, спец. аўтамашыны і інш.

Літ.: Троицкий Х. Л. Строительные машины, 2 изд., М., 1966.

І. М. Кевзік. Мінск.

БУДБАНК СССР, Усесаюзны банк фінансавання капітальных укладанняў.

Засн. ў 1922 як гандлёва-прамысловы банк адзелу (Прамбанк), пры якім у 1926 створаны аддзел доўгатэрміновага крэдытавання. У 1928 на базе гэтага аддзела і Электрабанка СССР, які існаваў раней, арганізаваны Банк доўгатэрміновага крэдытавання прамысловасці і электрагаспадаркі. У 1932 ператвораны ў Банк фінансавання капітальнага буд-ва прамысловасці, транспарту і сувязі. У 1959 пасля рэарганізацыі банкаў доўгатэрміновых укладанняў перайменаваны ў Банк фінансавання капітальных укладанняў — Б. СССР.

Асн. функцыі: мабілізацыя сродкаў для фінансавання капітальных укладанняў; фінансаванне капітальных укладанняў усіх галін нар. гасп. (за выключэннем с. гасп.); каротказтэрміновае крэдытаванне падрадных устаноў і будоўляў; доўгатэрміновае крэдытаванне мясцовай прамысл. і гарадской гасп.; доўгатэрміновае крэдытаванне жыллёва-будаўнічых кааператываў і індывідуальнага жыллёвага буд-ва; разлікі па фінансаванні, крэдытаванні і прыцягненні сродкаў. Б. СССР кантралюе выкарыстанне сродкаў, выкананне заданняў па ўводзе ў дзеянне прамысл. магутнасцей і асн. фондаў, зніжэнне кошту буд-ва, захаванне праектна-каштарысных планавай, фін. і плацежнай дысцыпліны. Падпарадкоўваецца Савету Міністраў СССР. У Б. СССР уваходзіць 1079 устаноў: 15 рэсп. кантор, 138 краявых і абл. кантор і кантор аўт. рэспублік, 23 гар. ўпраўленні, 341 адда. і 562 пункты ўпаўнаважаных. Праз Б. СССР праходзіць больш за 80% усіх сродкаў на капітальныя ўкладанні. У 1968 агульны аб'ём фінансавання склаў 35,7 млрд. руб. У Б. БССР ёсць рэсп. і 6 абл. кантор, 11 адда., 7 пунктаў упаўнаважаных.

В. Ф. Сонцаў. Мінск.


БУДЗЕЎСКАЯ (Будевска) Адрыяна (13.12.1878, Добрыч — 9.12.1955), балгарская актрыса. Нар. арт. НРБ (1953). Скончыла тэатр. вуч. Малога т-ра (Масква, 1899). Да 1923 у трупе «Сляза і смех» (Народны тэатр, Сафія). Садзейнічала станаўленню рэаліст. акцёрскага маст. ў Балгарыі. У лепшых вобразах, створаных Б., — пратэст супраць прыгнёту: Рада («Пад прыгнётам» І. Вазава), Свякроў («Свякроў» А. Страшымірава) і інш. Асаблівы поспех мела ў ролі Норы («Нора» Г. Ібсена).

БУДЗЕНАЎКА, вёска ў Кальчынскім с/с Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Ашмянка. За 3 *км* на З ад Ашмян, 247 *км* ад Гродна, 23 *км* ад чыг. ст. Ашмяны. 447 ж., двароў 131 (1970). Раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БУДЗЕНАЎСКАЯ парода коней, адна з лепшых верхавых парод, выведзеная ў 1921—48 скрыжаваннем данской, чарнаморскай і чыстакроўнай верхавой парод на конных заводах Растоўскай вобл. Адборам і падборам замацоўвалі рэзвасць, выносліваць і прыгожую канстытуцыю. Масць: рыжая, гнядая, бурая, часта з залацістым адлівам. Сярэднія прамеры жарабцоў (*см*): выш. ў карку 162,2; касая даўж. тулава 163,5; абхват грудзей 186; пясці 20,5; кабыл: адпаведна 161,8; 163,3; 189,4; 20. Сярэдняя жывая маса жарабцоў 550 *кг*, кабыл — 500 *кг*. Парода вызначаецца энергічным тэмпераментам, моцным здароўем і выносліваццю. У 1950 жарабец Занос (6 гадоў) пад коннікам за суткі прайшоў 309 *км*. Найлепшы вынік рэзвасці — 4000 *м* за 4 *мін* 43 *сек*. Коней гэтай пароды выкарыстоўваюць для верхавой язды, на лёгкіх транспартных работах, у конным спорце, для паляпшэння мясц. пород у стэпавых раёнах верхавой табуннай конегадоўлі СССР. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Конегадоўля*.

Літ.: Книга о лошади, сост. под руководством С. М. Буденного, т. 1, М., 1952.

БУДЗЕННЫ Сямён Міхайлавіч [н. 13(25).4.1883, хутар Казюрын Сальскай акругі вобл. Войска Данскога], сав. ваенны і дзярж. дзеяч, герой грамадзянскай вайны, Маршал Сав. Саюза (1935), тройчы Герой Сав. Саюза (1958, 1963, 1968). З сям'і батрака. Чл. КПСС з 1919. Удзельнік рускаяпонскай і 1-й сусв. войнаў. Летам 1917 разам з Каўказскай кав. дывізіяй прыбыў у Мінск, выбраны старшынёй палкавога і чл. дывізіённага к-таў. Меў сувязь з Мінскім к-там РСДРП(б). Па заданні



М. В. Фрунзе сарваў выкананне загаду галоўнакамандуючага Зах. фронту ўціхамірыць паўстанне салдатаў Гомельскага размеркавальнага пункта. Пад кіраўніцтвам Б. 1-я брыгада Каўказскай дывізіі разам з рэўкомам аршанскіх чыгуначнікаў раззброіла 5 эшалонаў карпілаўскай «дзікай» дывізіі, якая праз Оршу накіроўвалася на задушэнне рэвалюц. Петраграда. Пасля Кастр. рэвалюцыі змагаўся за ўстанаўленне Сав. улады на Дону. У 1918 сфарміраваў конны атрад, які перарос у дывізію. На чале дывізіі ўдзельнічаў у баях пад Царыцынам, змагаўся з войскамі ген. Краснова. З 1919 камандаваў конным корпусам, на базе якога створана Першая Конная армія, змагаўся супраць дзянікінцаў, белапалякаў, урангелеўцаў. У 1923 пам. галоўнакамандуючага Чырв. Арміі па кавалерыі і чл. Рэўваенсавета СССР. У 1924—37 інспектар кавалерыі Чырв. Арміі. У 1932 скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе. З 1937 камандуючы Маскоўскай ваен. акругі, з 1940 першы нам. наркома абароны СССР. У Айч. вайну камандуючы групай армій рэзерву Галоўнакамандавання, галоўнакамандуючы войск Паўд.-Зах. і Паўн.-Каўказскага напрамкаў, камандуючы Зах. рэзервовага і Паўн.-Каўказскага франтоў, кавалерыі Узброеных Сіл СССР. З 1953 інспектар кавалерыі Мін-ва абароны СССР. На XVII з'ездзе ВКП(б) выбраны канд. у чл. ЦК, на XVIII — чл. ЦК, на XIX — канд. у чл. ЦК КПСС. З 1920 чл. ВЦВК, з 1922 чл. ЦВК СССР; дэп. Вярх. Савета СССР 1—8-га скл., з 1938 чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Узнаг. 7 ордэнамі Леніна, 9 інш. ордэнамі СССР, медалямі, залатой баявой і ганаровай рэвалюц. зброяй, 2 зарубежнымі ордэнамі. Аўтар кнігі «Пройдзены шлях» (т. 1—2, 1959—65).

Літ.: История гражданской войны в СССР, т. 3—5, М., 1957—60; Сидоров В. И. Первая Конная армия, М., 1949.

Л. М. Лыч. Мінск.

БУДЗІКІД (г. н. і см. невлд.), князь Вял. кн. Літ. Упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1289, калі ён са сваім братам Будзівідам аддаў г. Ваўкавыск валынскаму кн. Мсціславу Данілавічу, каб захаваць з ім мір.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т. 2— Ипатьевская летопись, М., 1962.

БУДЗІЛАВА, вёска ў Соржыцкім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Каранеўскага. Прыстань на Зах. Дзвіне. За 20 *км* на ПнУ ад Бешанковіч, 37 *км* ад Віцебска. 549 ж., гасп. 191 (1970). Вытворча-нарыхтоўчы камбінат. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БУДЗІЛІН Іван Міхайлавіч (н. 25.12.1924, с. Аляксандраўскае Сімбірскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Вызначыўся ў кастр. 1943 у баях пад Лоевам Гомельскай вобл. Мал. сяржант Б. першы са сваім падраздзяленнем фарсіраваў Дняпро і пад артыл. агнём праціўніка наладзіў сувязь цераз раку. Жыве ў Інзенскім р-не Ульянаўскай вобл.

БУДЗІЛОВІЧ Ігнат Мартынавіч [1841—28.8 (9.9).1863], удзельнік паўстання 1863 на Беларусі. З дваран Валынскай губ. Скончыў Кіеўскі кадэцкі корпус (1859); служыў падпаручнікам у лейб-грэнадзёрскім Екацярынаслаўскім палку (Масква), належаў да рэвалюц. арг-цыі. У крас. 1863 уцёк з часці і з Л. *Звяждоўскім* выехаў на Магілёўшчыну, пад псеўданімамі Каткоў і Ян Піховіч арганізаваў і ўзначаліў паўстанцкі атрад у Аршанскім пав. 26.4.1863 атрад разбіты пад Пагосцішчамі. Паводле прыгавору ваен. суда Б. расстраляны ў Оршы.

Літ.: Дьяков В. А. Деятели русского и польского освободительного движения в царской армии 1856—1865 гг. (Биобиблиогр. словарь), М., 1967; Русско-польские революционные связи, т. 1, М., 1963 (Восстание 1863 года. Материалы и документы). *Г. В. Кісялёў.*

БУДЗІНСКІ (Budzyński) Станіслаў Іванавіч (парт. псеўд. Стах, Традыцыя; літ. псеўд. С. Бяднарскі, С. Марыянскі; 9.8.1894, Варшава — 22.8.1937), дзеяч польскага рэвалюц. руху, публіцыст. Чл. СДКПіЛ з 1912, у 1912—15 чл. Варшаўскага к-та. З 11.7.1915 да ліст. 1916 у турме. У сак. 1917 уступіў у РСДРП(б). Чл. бальшавіцкай фракцыі Маскоўскага Савета. З чэрв. 1917 чл. выканкома груп СДКПіЛ у Расіі. Актыўны ўдзельнік Кастр. рэвалюцыі, канд. у чл. Маскоўскага ВРК, з ліст. 1917 кіраўнік салд. секцыі Маскоўскага Савета. Чл. Маскоўскага абл. бюро РСДРП(б). З снеж. 1917 да сак. 1918 нарком сац. забеспячэння Масквы і Маскоўскай вобл. На I канфер. груп СДКПіЛ у Расіі (Петраград, студз. 1918) выбраны чл. ЦВК СДКПіЛ. З жн. 1918 у Польшчы. У ліст. 1918 выбраны чл. Галоўнага праўлення СДКПіЛ. Удзельнічаў у падрыхтоўцы аб'яднання СДКПіЛ з ППС-лявіцай у КПРП (снеж. 1918), чл. Лодзінскага, Варшаўскага к-таў КПРП. Адзін са стваральнікаў Саветаў і Чырв. гвардыі ў Заглэмбі, Лодзі, Варшаве. У канцы 1919 арыштаваны. У маі 1920 пры абмене палітзняволенымі паміж Сав. Расіяй і Польшчай прыехаў у Сав. Расію. Быў рэдактарам польскіх газет Рэўваенсавета Зах. фронту. У 1921—23 рэдактар газ. «Новый путь» сав. паўпрэдства ў Латвіі; у 1924—26 чл. Польбюро ЦК ВКП(б), адначасова рэдактар шэрагу польскіх выданняў, выкладчык філасофіі ў Камуніст. ун-це нац. меншасцей Захаду імя Мархлеўскага. З сак. 1927 чл. ЦК КПЗБ, са студз. 1929 чл. рэдакцыі цэнтр. органаў КПЗБ. З 1930 чл. Бюро ЦК КП(б)Б, рэд. газеты «Звязда», чл. рэдкалегіі час. «Бальшавік Беларусі». Адзін з арганізатараў і выкладчык палітэканоміі Камуніст. ун-та ў Мінску. У 1934—37 заг. кафедры ленінізма ў школе Выканкома Камінтэрна, нам. загадчыка кафедры ленінізма ў Вышэйшай школе парт. прапаганды пры ЦК ВКП(б). Аўтар грамадска-палітычных брашур і артыкулаў, рэдактар перакладаў на польскую мову твораў У. І. Леніна. *А. І. Марозава.* Мінск.



БУДЗІШЧА, вёска ў Нямойтаўскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 4 *км* на ПдУ ад Сянна, 101 *км* ад Віцебска, 19 *км* ад чыг. ст. Бурбін. 51 ж., двароў 13 (1970).

БУДЗЬКО Уладзімір Дамітрыевіч (н. 30.12.1927, в. Ліскі Рагачоўскага р-на Бабруйскай акр.), беларускі савецкі археолаг. Канд. гістар. н. (1962). З сялян. Чл. КПСС з 1965. Скончыў гістар. ф-т БДУ імя Леніна (1957). У 1961—64 навук. супрацоўнік, у 1965—69 заг. сектара археалогіі Ін-та гісторыі АН БССР, з 1970 дацэнт Гомельскага ун-та. Даследчык сярэдняга і верхняга палеаліту на тэр. Беларусі і РСФСР. Вёў раскопкі верхнепалеалітычных стаянак у *Бердыжы*, *Елісеевічах*, *Юдзінаве*, *Юравічах*.

Тв.: Памятники свидерско-гренской культуры на территории Белоруссии, М.—Л., 1966 (Материалы и исследования по археологии СССР, т. 126); Юревичская верхнепалеолитическая стоянка, у кн.: Белорусские древности, Мн., 1967; (разам з А. Р. Мітрафанавым) Археология Белоруссии за советский период, «Советская археология», 1967, № 4.

БУДКА, вёска ў Капараўскім с/с Рачыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Камунар». За 18 *км* на ПдЗ ад Рачыцы, 68 *км* ад Гомеля, 6 *км* ад чыг. ст. Дземяхі, на шашы Гомель — Калінкавічы. 444 ж., двароў 135 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка.

БУДКЕР Герш Іцкавіч (н. 1.5.1918, в. Мурафа Падольскай губ.), савецкі фізік. Акадэмік АН СССР (1964, чл.-кар. 1958). У 1946—57 працаваў у Ін-це атамнай энергіі АН СССР, з 1957 дырэктар Ін-та ядзернай фізікі Сібірскага аддз. АН СССР. Асн. навук. працы па тэорыі атамных рэактараў, тэорыі і разліку паскаральнікаў зараджаных часцінак, па фізіцы плазмы. Ленінская прэмія 1967.



Тв.: Ускорители со встречными пучками частиц, «Успехи физических наук», 1966, т. 89, в. 4. *Літ.:* Беляев С. Т., Сидоров В. А. и Чириков В. В. Герш Ицкович Будкер, «Успехи физических наук», 1968, т. 96, в. 3.

БУДЛЯНКА, рака, правы прыток Расты (бас. Дняпра). Даўж. 24 *км*. Цячэ ў Магілёўскім, Быхаўскім і Чавускім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (170 *км*²) — узгорыстая, слаба перасечаная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,9 *м*³/*сек*.

БУДНІК Ганна Іванаўна (н. 1.9.1924, в. Курыцічы Петрыкаўскага р-на Мазырскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці. Герой Сац. Працы (1951). З 1939 у калгасе «Шлях да сацыялізма» Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. У 1951—53 звеннявая па вырошчванні кок-сагызу, з 1953 калгасніца калгаса «Бальшавік» гэтага р-на. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

БУДНІКІ, група прыгонных сялян або вольнанаёмных рабочых на Беларусі ў 15—18 ст., якія працавалі на лясных промыслах — *будах*. Гал. занятак Б. — спальваць (звычайна вясною) пэўныя пароды драўніны, каб атрымаць попел, з якога карытнікі і палівачы выварвалі паташ, неабходны для вытв. шкла. Б. гналі смалу, дзёгаць, выпальвалі драўняны вугаль, выраблялі клёпкі для патрэб саміх будаў і бандарнай вытворчасці. Пасля заняпаду ў 18 ст. лясных промыслаў буды ператварыліся ў звычайныя вёскі, жыхароў якіх да 2-й пал. 19 ст. звалі буднікамі.

Літ.: Мелешко В. И. Из истории аграрных отношений в Восточной Белоруссии в период упадка Речи Посполитой, «Acta Baltico-Slavica», Białystok, 1967, [t.] 5.

БУДНЫ Сымон (1530—13.1.1593), беларускі гуманіст, рэфармацыйны дзеяч і асветнік, філосаф, сацыёлаг, філолаг, гісторык. Адукацыю атрымаў у Кракаўскім ун-це. З 1558 настаўнік у пратэстанцкай школе ў Вільні, з 1560 кальвінісцкі прапаведнік у Клецку. У 1562 з Л. *Крышкоўскім* і М. *Кавячынскім* заснаваў у Нясвіжы друкарню і выдаў на бел. мове «Катэхізіс», «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам» і інш. творы. Незадаволены памяркоўнасцю *кальвінізму*, Б. пераходзіць на больш радыкальныя рэфармац. пазіцыі антытрынітарызму (гл. *Антытрынітарыі*). 18.4.1563 пасылае ліст у Цюрых швейц. тэолагу Г. Булінгеру, дзе выказвае сумненне ў праўдзівасці хрысц. догмату тройцы. У 60-я г. перакладае Біблію на польскую мову. З 1573 прапаведнік у Лоску (калля Маладзечна). Тут у створанай ім друкарні ў 1574 надрукаваў свой пераклад Новага запавету, дадаўшы да яго прадмову і заўвагі. Гэта, як адзначыў польскі гісторык Г. Мерчынг, «першая ў сусветнай літаратуры спроба ўсебаковай крытыкі тэкстаў Новага запавету». У 1574 з лоскай друкарні выходзяць творы Б. «Пра дзве сутнасці Хрыста», «Супраць хрышчэння дзяцей», «Наконт аргументаў Сімлера пра дзве сутнасці Хрыста», «Кароткі доказ, што Хрыстос не з'яўляецца такім жа богам, як айцец...» і інш. У тым самым годзе Б. піша ліст англ. гісторыку Дж. Фоксу, у якім выступіў супраць царк. догмату пра боскую прыроду Хрыста. У 1576 выдаў твор «Пра найважнейшыя артыкулы хрысціянскай веры», дзе абагульніў свае рэліг.-філас. вывады. Як ідэолаг бел. радыкальна-рэфармац. руху ўдзельнічае ў рабоце арыянскіх сінодаў. Палемізуе па рэліг. і сац. пытаннях з ідэолагамі арыянскай «лявіцы» *Пятром з Ганёндза*, *Якубам з Калінаўкі*, М. *Чаховіцам*. У 1583 выдае твор «Пра свецкую ўладу», дзе апісвае гісторыю спрэчак прадстаўнікоў левага і правага крыла антытрынітарызму пра адносіны да феад. грамадства і дзяржавы. За гэты твор у 1584 Б. выключылі з брацкай абшчыны. У 1589 ён разам з Ф. *Даманеўскім* актыўна ўдзельнічае ў Полацку ў дыспуце з езуітамі і абараняе тэзіс, што душа памірае з целам чалавека, што няма ні пекла, ні раю. Б. — адзін з заснавальнікаў навук. крытыкі Бібліі, папярэднік Б. Спіназы і ліберцінаў 17—18 ст. Ідэі Б., развітыя Ф. *Соцынам* і яго паслядоўнікамі, зрабілі ўплыў на развіццё еўрап. рацыяналізму 17 ст. Творы Б. садзейнічалі фарміраванню рус. вальнадумства. Рацыяналістычнае вучэнне Б. падрыхтавала глебу для развіцця на Беларусі атэіст. і матэрыялістычнай думкі. Б. — ідэолаг прагрэсіўна настроенай бел. шляхты і гараджан. Апраўдваючы тагачасныя грамадз. і дзярж. асновы, і менавіта прыгоніцтва, ён патрабаваў абмежавання феад. самавольства. Феадалаў і прадстаўнікоў свецкай улады, якія «цяжкія трудности подданым чинят», ён называў «окрутниками», «мучителями», «лупежниками». Выступаў за роўнасць усіх саслоўяў перад законам і справядлівасць правасуддзя. Яго палітычны ідэал — асвечаная манархія, абмежаваная саслоўным прадстаўніцтвам і законам. Войны ён падзяляў на справядлівыя, якія вядуцца дзеля абароны радзімы, і несправядлівыя, захопніцкія. Асуджаў агрэсіўную палітыку феадалаў, лічыў, што для простага народу, для развіцця рамяства і гандлю, распаўсюджвання асветы патрэбен мір, што феадалы, багатыя гараджане павінны клапаціцца пра адукацыю простага народу і не шкадаваць сродкаў на будаванне школ. Адзін з самых адукаваных філолагаў-гуманістаў свайго часу. Ён зрабіў вялікі ўклад у развіццё бел. мовы, выступаў за ўсебаковае супрацоўніцтва ўсіх славянскіх народаў. Б. — прадаўжальнік традыцый Ф. *Скарыны*.

Тв.: Катихисис, то ест наука стародавная христианьская от светого писма, для простых людей языка русского, в пытаннах и отказех собрана, Несвиж, 1562; Из предисловия к переводу Нового завета. Приписки к переводу некоторых мест Нового завета. Из письма к Фоксу, у кн.: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Избр. произв., Мн., 1962; O urzędzie miecza używającem, Warszawa, 1932; O przedniejszych wiary chrystyańskiej artykułech, 1576, у кн.: Literatura ariańska w Polsce XVI w. Antologia, Warszawa, 1959.


Літ.: Алексютович Н. А. Будный — идеолог гуманизма и реформации в Белоруссии и Литве, у кн.: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Избр. произв., Мн., 1962; Порецкий Я. И. Симон Будный — передовой белорусский мыслитель XVI в., Мн.,

1961; Падокшын С. Святло далёкага мінулага, «Полымя», 1968, № 4; яго ж. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы, Мн., 1970; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968. *С. А. Падокшын.* Мінск.

БУДСЛАЎ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., на р. Сэрвач. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Будслаўскі». За 56 *км* на У ад Мядзела, 130 *км* ад Мінска, 4 *км* ад чыг. ст. Будслаў. 859 ж., двароў 318 (1970). Спірт. з-д, Крывіцкае буд.-мантажнае ўпраўленне, камбінат быт. абслугоўвання, лясніцтва, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, адда. сувязі, 8 магазінаў. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 50 яе жыхароў. Арх. помнік — *Будслаўскі касцёл.*

БУДСЛАЎСКІ КАСЦЕЛ бернардынцаў, помнік архітэктуры позняга барока. Пабудаваны ў 1783 у *Будславе.* Пры яго будаўніцтве выкарыстаны часткі касцёла сярэдзіны 17 ст. Займае прамежкавае становішча паміж біскупальнай і купальнай ба-





Будслаўскі касцёл. Від з паўд.-захаду (уверсе); план 2-га яруса.

зілікай. Мае выцягнуты сярэдні неф з размешчаным у яго глыбіні алтаром (апсіды няма) і трансептам каля ўваходу. Над перасячэннем трансепта і сярэдняга нефа — сферычнае перакрыцце, схаванае ўсярэдзіне даху. Двухвежавы фасад перанасычаны (па вертыкалі і гарызанталі) пілястрамі, паўкалонамі, складанымі раскрапоўкамі. Цэнтр фасада (шчыт з франтонам) нагадвае скульптурны масіў з фігурным грэбенем.

БУДЧА, вёска ў Чудзінскім с/с Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл., на р. Лань (прыток Прыпяці). Цэнтр калгаса «50 гадоў БССР». За 30 *км* на У ад Ганцавіч, 272 *км* ад Брэста. 1411 ж., гасп. 450 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны.

БУДЫ, вёска ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Жданава. За 6 *км* на У ад Горак, 130 *км* (па шашы праз Горкі і Оршу) ад Магілёва, 7 *км* ад чыг. ст. Пагодзіна. 215 ж., двароў 56 (1970). Пач. школа, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін. У Вял. Айч. вайну вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

БУДЫ (Новыя Буды), чыг. ст. на лініі Лунінец — Вільнюс, вёска ў Куршынавіцкім с/с Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. За 30 *км* на Пд ад Ляхавіч, 230 *км* ад Брэста. 209 ж., гасп. 63 (1970). Пач. школа, база Ганцавіцкага леспрамгаса, фельч.-ак. пункт, магазін.

БУДЫЗМ, адна са стараж. рэлігій. Узнік у 6—5 ст. да н. э. ў Індыі. Паводле будыйскага падання заснавальнік Б. — Сідхартха Гаўтама (гл. *Буда*). Культ. догматы і маральныя прынцыпы Б. склаліся ва ўмовах узнікнення рабаўладальніцкіх дзяржаў і былі накіраваны супраць рэлігіі *брахманізму.* Ранні Б., які ўраўноўваў усіх людзей у «пакутах» і праве на «ратунак», адлюстроўваў пратэст гарадской беднаты і землеўладальнікаў-абшчыннікаў супраць іх разарэння і заняволення. Рабаўладальніцкая знаць шырока распаўсюджвала Б. з яго пропаведдзю пакорлівасці, пасіўнага сузірання і прымірэння з рэчаіснасцю.

Б. шукаў вызвалення ад пакут не ў сац. пераўтварэннях, а ў маральным удасканаленні праз адмаўленне ад зямных даброт. Уяўленні пра свет, сэнс жыцця і прызначэнне чалавека вызначаюцца ў Б. неабычайнай складанасцю. Паводле вучэння Б. свет сатканы з містычных часцінак, нематэрыяльных элементаў — дхармаў. Прадметны свет утвараецца з «успышак» і «патуханняў» дхармаў. Такая і прырода чалавека. Яго нараджэнне і смерць — звяно ў ланцугу пераўвасабленняў дхармаў, адна з формаў вечнага быцця. У дастасаванні да чалавека гэта азначае, што яго існаванне вызначана папярэднім станам дхармы. З рэліг.-ідэаліст. разумення сутнасці чалавека выводзіцца маральны абавязак перад наступным звяном. Чалавек павінен жыць так, каб пазбавіць сваю дхарму ад блуканняў і пераўвасабленняў і дасягнуць вечнай асалоды — нірваны. Гэтай найвыш. мэты можна дасягнуць пакутамі і самаўдасканаленнем. У 1 ст. н. э. ўзнікла новая форма Б. — махаяна, якая пашырае культ Буды і выратаванне чалавека ставіць у залежнасць ад волі бога.

Эканам. і паліт. ўплыў Індыі на суседнія краіны Цэнтр. і Усх. Азіі спрыяў пашырэнню Б. ў Кітаі, Японіі, Манголіі, Бірме, Карэі і інш. краінах. У Індыі Б. зблізіўся з брахманізмам і ўтварыў новую рэлігію — *індуізм.*

Літ.: Кочетов А. Н. Происхождение буддизма, у кн.: Ежегодник Музея истории религии и атеизма, сб. 1, М.— Л., 1957; Ильин Г. Ф. Религия древней Индии, М., 1959.

Г. А. Марціросаў. Гродна.

БУДЫКА Сяргей Хрыстафаравіч [н. 17(30).3.1909, Екацярынадар], беларускі савецкі вучоны ў галіне гідратэхнікі. Д-р тэхн. н. (1959), праф. (1960). Чл. КПСС з 1944. Заг. кафедры воднага транспарту і гідраўлікі (1945), прарэктар па навуковай рабоце Бел. тэхнал. ін-та (1959—63). Старшыня савета па праблеме Палесся пры АН БССР (з 1965). Пад кіраўніцтвам Б. створаны машыны БТІ-1 і БТІ-2, якія звязваюць бярвенне ў плоскія плыты на малых рэках (замест молевага сплаву). Працы Б. пра гідратэхн. меліярацыю лясных земляў Палесся, рэгуляванне сцёку мелкіх рэк і водагаспадарчыя разлікі для

лесатранспартных мэт. Высветліў заканамернасці ўплыву лясістых басейнаў на сцёк рэк і яго размеркаванне; выявіў дзеянне затапленняў і падтапленняў на рост лесу.

Тв.: Освоение малых рек БССР для целей лесосплава, Мн., 1949; Лесные гидротехнические мелиорации, Мн., 1954; Основные принципы и методы гидротехнических мелиораций лесов Полесья, «Труды Ин-та леса АН СССР», 1959, т. 49; (разам з А. Ф. Ціханавым) Лесопромышленный справочник, Мн., 1962; (разам з І. К. Блінцовым) Гидротехнические мелиорации лесных земель, Мн., 1967; (разам з Г. А. Манухіным і А. М. Піменавым) Водный транспорт леса и механизация лесосплавных работ, Мн., 1969.

БУЕР (гал. bôeier), лёгкая лодка ці платформа з парусамі на трох металічных канькох (лыжах, пнеўмаколах). Кіраванне Б. робіцца заднім каньком (лыжай, колам) і парусам. Выкарыстоўваюцца ў спарт. спаборніцтвах, для трэніроўкі яхтсменаў, перавозкі грузаў. Скорасць руху падчас перавышае 100 *км/гадз.*

БУЕЎСКАЕ, возера ў бас. р. Мошна (бас. Лучосы), у Лёзненскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,59 *км²*. Катлавіна выцягнута з З на У. Пл. вадазбору 9,75 *км²*. Водзяцца лешч, верхаводка, плотка, шчупак, акунь і інш.

БУЖА, возера ў бас. р. Друйкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 3,95 *км²*. Даўж. 3,6 *км*, найбольшая шыр. 2 *км*, сярэдняя 1 *км*, найбольшая глыб. 8,5 *м*, сярэдняя 4,3 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. На воз. 11 а-воў. Дно плоскае. Пл. вадазбору 49,2 *км²*. Воз. эўтрофнага тыпу. Прыбярэжная частка зарастае трыснягом і чаротам. Злучана пратокамі з азёрамі Саванар і Рака. Водзяцца лешч, шчупак, плотка, судак, лінь, акунь.

БУЖАНЕ, старажытнае ўсходнеславянскае племя (магчыма, саюз плямёнаў), якое ў 6—9 ст. жыло ў басейне Зах. Буга. Археал. раскопкамі высветлена, што Б. з глыбокай старажытнасці жылі асела, займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, бортніцтвам, рамёствамі. Упамінаюцца ў «Аповесці мінулых часоў». На думку чэхаславацкага гісторыка П. І. Шафарыка, у 5 ст. да н. э. яны называліся будзінамі, а ў першыя ст. н. э. — сербамі. Паводле звестак географа Баварскага (канец 9 ст.), Б. мелі 231 «горад» (замак). У 10 ст. ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі. З 12 ст. жыхароў зямель Пабужжа называлі па гал. гарадах княстваў (драгічынцы, берасцейцы і інш.). З 13 ст. пашыраецца новая назва гэтых зямель — Падляшша, а з 1569 — Падляссе. У л-ры 19 ст. сустракаецца тоеснасць Б. з *валынянамі, палешукамі.*

Літ.: Третьяков П. Н. Восточнославянские племена, 2 изд., М., 1953, с. 245—251; Шафарик П. Й. Славянские древности, 2 изд., пер. с чеш., т. 1—2, М., 1848.

БУЖУМБУРА (Bujumbura), сталіца Бурундзі. Грузавы і рыбалоўны порт на беразе воз. Танганьіка. Вузел аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 70 тыс. ж. (1967). Прамысл. для перапрацоўкі с.-г. сыравіны. Цэментны і піваварны з-ды. Ф-кі коўдраў і сеткавязальная. Вываз бавоўны, кавы, скур, канцэнтратаў каляровых металаў.

БУЖЫНСКІ Станіслаў Антоні (г. н. невяд. — п. каля 1765), дзярж. дзеяч Рэчы Паспалітай, сенатар, юрыст. З 1731 інстыгатар (пракурор) Вял. кн. Літ., з 1750 кашталян брэсцкі, з 1752 кашталян смаленскі. Няраз выбіраўся дэпутатам у сейм, з 1740 падрыхтоўваў яго пастановы. Сабраў для апублікавання найважн. пастановы сеймаў Рэчы Паспалітай з пач. дзейнасці да сярэдзіны 18 ст. (выдадзены ў 1765 яго сынам Т. *Бужынскім*).

БУЖЫНСКІ Тадэвуш (г. н. невяд. — 1773), дзярж. дзеяч і дыпламат Рэчы Паспалітай, сын С. А. *Бужынскага.* Староста краснасельскі і ротмістр войска Вял. кн. Літ., з 1763 кашталян смаленскі, з 1769 ваявода мінскі. Удзельнічаў у падрыхтоўцы пастаноў сейма 1767—68, якія расшыралі правы праваслаўнай і пратэстанцкай шляхты, спрыялі ўмацаванню ўлады караля. Садзейнічаў паляпшэнню ўзаемаадносін Рэчы Паспалітай з Расіяй, у 1769—73 пасол у Галандыі і Англіі.

БУЗІНА (Sambucus), род кустоў або невялікіх дрэў сям. бружмелевых. Выш. 1,5—6(10) *м*. Галінкі голыя або з кароткімі валаскамі. Лісце няпарнаперыстае з непрыемным пахам. Кветкі дробныя, белыя, жоўтыя, іншы раз чырвоныя ў шчытка-кападобных ці мяцёлчатых суквецці. Плод — мясістая касцянка. Вядома 40 відаў, пашыраных ва ўмераным і субтрапічным паясах абодвух паўшар'яў. У СССР 11, на Беларусі 2 — Б. чорная (S. nigra, нар. назва баз чорны) і Б. чырвоная (S. racemosa); вырошчваюцца як дэкаратыўныя. Б. чорная мае лекавыя ўласцівасці. Прэпараты з яе пладоў і кары ўжываюцца ў медыцыне.



Бузіна чорная: *1* — асобныя кветкі; *2* — галінка з кветкамі; *3* — галінка з пладамі.

БУЗОНІ (Busoni) Феручыо Бенвенута (1.4.1866, Эмпалі каля Фларэнцыі — 27.7.1924), італьянскі піяніст, дырыжор, кампазітар. У 1890—91 праф. Маск. кансерваторыі. Прэмія за муз. творы на конкурсе імя А. Рубінштэйна ў Пецярбурзе (1890). Як піяніст найбольш значны пасля Ф. Ліста і А. Рубінштэйна. Адзін з першых тэарэтыкаў неакласіцызму. З твораў (4 оперы, сімф. сюіты, канцэрты і інш.) найчасцей выконваюцца фп. транскрыпцыі арганных п'ес І. С. Баха.

Літ.: Коган Г. М. Ферруччо Бузони, М., 1964.

БУЗУК Пётр Апанасавіч [2(14).7.1891, в. Цярноўка ў Малдавіі — 7.10.1943], беларускі савецкі моваznавец. Д-р філал. н. (1924), праф. БДУ (1925). З сям'і настаўніка. Скончыў Адэскі ун-т (1916). З 1926 заг. дыялекталаг. камісіі Інбелкульта. У 1931—33 дырэктар Ін-та моваznаўства АН БССР і заг. кафедры моваznаўства Мінскага пед. ін-та. Даследаваў гісторыю праславянскай мовы, праблемы ўтварэння асобных моўных груп

эпохі праслав. адзінства. Цэнтр. месца ў працах Б. належыць дыялекталогіі і лінгвіст. геаграфіі. Аўтар першага слав. дыялекталаг. атласа. Шмат увагі аддаваў узаемаадносінам бел. літ. мовы і дыялектаў, культуры бел. мовы, станаўленню яе правапісных і графічных нормаў. Вывучаў укр. мову і яе ўзаемасувязь з бел. («Украінскія этымалогіі», 1926; «Нарыс гісторыі ўкраінскай мовы», 1927; «Узаемаадносіны паміж украінскай і беларускай мовамі», 1926). Пад псеўд. П. Росіч друкаваў вершы і апавяданні.



Тв.: Спроба гісторыі дагістарычнай эпохі славянскай фанетыкі, Мн., 1927; Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі, ч. 1, в. 1, Мн., 1928.

Літ.: Рамановіч Я. і Юрэвіч А., П. А. Бузук, Мн., 1969, [бібліягр.].

БУІДАЎ ДЗЯРЖАВА, феад. дзяржава на Блізкім і Сярэднім Усходзе (935—1055). Уключала тэр. Зах. і Паўд. Ірана, Ірака Арабскага.

Заснавальнікамі Б. дз. былі браты Ахмед, Алі і Хасан Буіды. У 945 яны занялі Багдад, што прывяло да падзення *Абасідаў халіфата*. Найб. магутнасці Б. дз. дасягнула ў 2-й пал. 10 ст., калі пад яе ўладу трапіла Аравія (Аман, Емен). У гэты час вялося значнае будаўніцтва, ваахвочваліся навукі, мастацтва. Адсутнасць цесных эканам. і паліт. сувязей паміж асобнымі часткамі дзяржавы, рост феад. раздробленасці прывялі Б. дз. да заняпаду. У 1055 яе заваявалі сельджукі.

БУЙВАЛЫ, млекакормячыя жывёлы атр. парнакапытных. Цела грузнае, укрытае рэдкай поўсцю. Ногі кароткія, тоўстыя, хвост доўгі. Рогі вялікія, трохгранныя. Б. пашыраны ў Паўд. Азіі і Афрыцы (на Пд ад Сахары). 3 роды, 4 віды. Стадныя, палігамныя жывёлы. Кормяцца раслінамі. Жывуць да 20 гадоў. У Азіі — 2 роды: Bubalus і Anoa. Да першага належаць індыйскі вадзяны Б. (B. bubalus) і філіпінскі Б. (B. mindorensis). Індыйскі Б., або арні,— жывёліна выш. да 2 *м* (маса да 500 *кг*). Дзікія водзяцца ў балоцістых лясах і прыбярэжных зарасніках у Індыі, Індакітаі, Бірме, на а-вах Цэйлон і Калімантан. У далёкім мінулым Б. прыручаны чалавекам і цяпер як свойская жывёла жыве ў Паўд. Азіі, Афрыцы і Паўд. Еўропе. Добрая цяглавая сіла ва ўмовах гарачага вільготнага клімату. У СССР гадуюць у Закаўказзі і часткова ў Крыме. Філіпінскі Б. пашыраны на Філіпінскіх а-вах. У родзе Anoa 1 від — A. depressicornis. Выш. яго да 1 *м*. Жыве ў горных лясах в-ва Сулавесі. Трэці род Б. (афрыканскіх) прадстаўляе Sincerus caffer (афрыканскі, або кафрскі, Б.). Жыве ў саванах, аб'ект палявання.

Літ.: Агабейли А. А. Буйволы, М., 1967 (бібліягр.); Гептнер В. Г., Насимович А. А. и Банников А. Г. Млекопитающие Советского Союза, т. 1, М., 1961. *Ю. І. Сяржанін.* Мінск.

БУЙВІД (г. н. і см. невяд.), кіраўнік сялянскага паўстання ў Вял. кн. Літ. у 1544—45. Сяляне Укмергскай і Анікштайскай ваколасцей, незадаволеныя патрабаваннем вял. князя адправіць данікло (падатак) у Вільню, а таксама злоўжываннямі акапома Кміта, напалі на атрад вялікакняскага прадстаўніка Ката. Неўзабаве атраду вял. князя ўдалося ўзяць Б. ў палон, але паўстанцы доўга яшчэ не спынялі барацьбы.

БУЙКІ, вёска ў Сырмежскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Горкага. За 45 *км* на ПдЗ ад Мядзела, 160 *км* ад Мінска, 43 *км* ад чыг. ст. Вілейка. 148 ж., двароў 40 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт.

БУЙКІ, вёска ў Шаркоўшчынскім р-не Віцебскай вобл. на р. Густатка. Цэнтр сельсавета. За 3 *км* на ПнЗ ад Шаркоўшчыны, 200 *км* ад Віцебска. 89 ж., двароў 32 (1970). Пач. школа.

БУЙКО Аляксандр Міхайлавіч (1885, в. Астраўляны Дзісенскага пав. Віленскай губ.— 30.1.1941), прафесійны рэвалюцыянер. З сялян. Член КПСС з 1904. З 1897 рабочы Пуцілаўскага завода ў Пецярбурзе. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—07. З 1906 чл. Пецярбургскага камітэта РСДРП, у 1907—09 чл. яго Выканаўчай камісіі. Удзельнік V Усерасійскай парт. канферэнцыі ў Парыжы (1908). У сак. 1909 арыштаваны царскімі ўладамі і сасланы ў Сібір на вечнае пасяленне. Пасля Люты рэвалюцыі 1917 нам. старшыні Верхнеудзінскага (з 1934 Улан-Удэ) Савета. Са студз. 1918 старшыня Рэв. трыбунала Прыбайкалля. Пасля захопу Забайкалля белагвардзейцамі эмігрыраваў у Манголію, потым у Кітай. Адзін з кіраўнікоў разгрому войск Унгерна. У 1920 кіраўнік прамысловасці Амурскай вобл. З пач. 1921 эмісар Далёкаўсходняй Рэспублікі ў Прыбайкаллі. У чэрв. 1921 выбраны чл., потым сакратаром Бюро ЦК РКП(б) па Д. Усходзе. З 1922 старшыня Нар. сходу Далёкаўсходняй Рэспублікі, нам. наркома гандлю РСФСР. У 1933—41 нам. галоўнага арбітра РСФСР. Аўтар кн. «Шлях рабочага» (1934). *М. Ф. Мельнікаў.* Крычаў.



БУЙКО Пётр Міхайлавіч [7(19).10.1895, Бельск Гродзенскай губерні — 15.10.1943], акушэр-гінеколаг, прафесар (1938). Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1921. З 1917 удзельнік рэвалюц. руху ў Кіеве і барацьбы супраць Укр. цэнтр. рады. У 1922 скончыў Кіеўскі мед. ін-т, працаваў у ім на кафедры акушэрства. З 1933 дырэктар Кіеўскага ін-та аховы мацярынства і дзяцінства. У Айч. вайну ў Чырв. Арміі. З ліп. 1943 урач у партыз. атрадзе на Украіне. У час бою фашысты захапілі Б. ў палон і спалілі жывым. Імем Б. названы Кіеўскі ін-т аховы мацярынства і дзяцінства.



БУЙЛО (Калечыц) Канстанцыя Антонаўна [н. 30.12.1898(11.1.1899), в. Барсуковіна Ашмянскага пав. Віленскай губ.], беларуская савецкая паэтэса. Засл. дз. культ. БССР (1968). З сялян. Скончыла настаўніцкія курсы ў Вільні. Настаўнічала на Лідчыне, загадвала бел. кнігарняй у Полацку (1915—16). Друкуецца з 1909. Першы зб. «Курганная кветка» (1914) адрэдагаваў Я. Купала. На фарміраванне творчасці Б. значна ўплываў фальклор. Эмацыянальны пачатак, вобразна-экспрэсіўныя элементы нар. паэтыкі выразна выступаюць у рамант. вершах, інтымнай і патрыят. лірыцы («Люблю», «Беларусі», «Звон», «Курганная кветка», «Ляці, думка», «Ці помніш ты»). Асн. тэма дакастр. творчасці — роздум пра нядолю і бяспраўнасць бел. селяніна. Нар. міфалогію выкарыстоўвае ў вершаванай драме «Кветка папараці» (1914). У Айч. вайну і пасля пісала пра гераізм сав. воінаў, бел. партызанаў, мірную стваральную працу сав. людзей. Некат. творы Б. сталі нар. песнямі («Люблю», «Каб я мела...»). Аўтар зб. «Світанне» (1950), «На адноўленай зямлі» (1961). Вершы для дзяцей у зб. «Юрачка» (1957), «У бляску зор» (1968). З 1923 жыве ў Маскве. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Выбраныя творы, Мн., 1954; Выбранае, Мн., 1968; Май, Мн., 1965; Па пройдзеным шляху, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.


Літ.: Тарас Н. Пяснярка роднай зямлі. «Полымя», 1968, №12. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

БУЙМІНА (Cardamine), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. крыжакветных. Сцябло галінастае, выш. 5—100 *см*. Лісце перыстаскладанае, радзей цэласнае. Кветкі белыя або бледна-фіялетавыя ў гронках. Вядома каля 100 відаў, пашыраных у Еўропе, Паўн. Амерыцы, Кітаі, Японіі. У СССР каля 30; на Беларусі 7, з іх найб. вядомыя Б. горкая (C. amara, нар. назвы: баймана, жаруха, макруха) і Б. лугавая (C. pratensis). Абедзве атрутныя для коней і буйн. раг. жывёлы (у кароў псуецца малако). Б. лугавая — добры меданос.

БУЙНАБЛОЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ, зборныя канструкцыі будынкаў і збудаванняў з вялікіх блокаў. Найб. пашыраны ў буд-ве жылых дамоў, школ, бальніц і г. д., а таксама ідуць на фундаменты збудаванняў розных тыпаў. У залежнасці ад колькасці радоў блокаў у межах вышыні аднаго паверха адрозніваюць двух-, трох- і чатырохрадковую разрэзку сцен. Аптымальнай з'яўляецца двухрадковая. Маса да 3 *т*, шыр. роўная патрэбнай шырыні сцяны. Бываюць суцэльныя, пустацелыя, з дымавымі ці вентыляцыйнымі каналамі. Штучныя блокі робяць з бетону, сілікату і пенасілікату. Першыя жылыя дамы з сілікатных буйных блокаў пабудаваны ў Мінску па вул. Валгаградскай.

БУЙНАВІЧЫ, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Буйнавічы». За 22 *км* на ПнУ ад Лельчыц, 198 *км* ад Гомеля, 45 *км* ад чыг. ст. Ельск. 1802 ж., двароў 504 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання, пякарня. Сярэдняя школа, санаторная школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 6 магазінаў, сталовая, лясніцтва. Ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 146 яе жыхароў. 2 помнікі сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

БУЙНАПАНЕЛЬНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ, зборныя канструкцыі будынкаў і збудаванняў з панеляў (пліт) вялікіх памераў. Вырабляюцца з цяжкага і лёгкага бетону, гіпсабетону, азбестацэменту на з-дзе; на будоўлі толькі манціруюцца. Маса пераважна 3—5 *т*. Ужываюцца ў жыллёвым і прамысл. буд-ве. З панеляў робяць сцены, перакрыцці, перагародкі, пакрыцці. Вышыня сценавых панеляў роўная вышыні аднаго, радзей 2 паверхаў. У каркасна-панельным будынку панелі навешваюцца на каркас і могуць выраблялцца з аблегчаных матэрыялаў; у бескаркасным ставяцца адна на адну; выконваюць ролю нясучых і агараджальных канструкцый. Буйнапанельнае буд-ва на Беларусі вядзецца з 1957 і дасягнула (1969) 40% ад агульнага аб'ёму жыллёвага буд-ва. Пашырана ў сацыяліст. краінах, а таксама ў Данії, Францыі, Швецыі, Англіі і інш.



Мантаж жылога дома з буйных панеляў у мікрараёне Усход-1 у Мінску.

Літ.: Дроздов П. Ф. и Себекин П. М. Проектирование крупнопанельных зданий, М., 1967; Морозов Н. В. Конструкции стен крупнопанельных зданий, М., 1964. *У. І. Скрыбо.* Мінск.

БУЙНАПЛОДНАЯ, селекцыйны беларускі сорт слівы. Выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы Э. П. Сюбаравай (1936) скрыжаваннем сартоў Ачакаўская жоўтая і Пашкевіча. Плады важаць 60—65 *г*, яйцападобныя, светла-жоўтыя, з размытым румянцам; мякаць сакаўная, салодкая, з мядовай духмянасцю; выспяваюць у канцы

жніўня — пач. верасня. Пладаносіць з 4—5 гадоў, у 8—9 гадоў дае да 25 *кг* пладоў з дрэва. Найлепшыя апыляльнікі: Персікавая Мічурына, Кірке. Б. ўключана ў стандартны сартымент у паўд. садовай зоне БССР. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Сліва*.

БУЙНАЯ БЕЛАЯ парода свіней, выведзена ў сярэдзіне 19 ст. ў Англіі складаным узнаўленчым скрыжаваннем мясцовых даўгавухіх свіней з еўрапейскімі і азіяцкіміародамі. У Расію завезена ў 2-й пал. 19 ст. Айчынная парода адрозніваецца ад англійскай моцнай канстытуцыяй і большай плоднасцю. Тулава доўгае, спіна роўная, шырокая, вушы невялікія. Сярэдняя маса 3-гадовых і старэйшых кныроў 250—350 *кг*, даўж. тулава да 170 *см*, самак адпаведна 220—260 *кг* і 160 *см*. Плоднасць 10—12 парасят за апарос. Жывая маса 6—7-месячнага падсвінка на адкорме каля 100 *кг*. Свінні гэтай пароды шырока выкарыстоўваюцца для вывядзення новых парод, прыдатныя на мясны і беконны адкорм. У БССР гадуюць ва ўсіх абл. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Свінагадоўля*.

БУЙНАЯ РАГАТАЯ ЖЫВЁЛА, свойскія каровы, быкі, валы. Належыць да класа млекакормячых (Mammalia) атр. парнакапытных (Atridactilia) сям. пустарогіх (Cavicornia). Паходзіць ад *тура*. Сярэдняя маса кароў 400—600, быкоў 700—1200 *кг*. Расце да 5, радзей да 6—7 гадоў. Жыве каля 20 гадоў. Тэрмін гасп. выкарыстання 10—12 гадоў. Перыяд цельнасці ў сярэднім 285 дзён. Прыплод: адно, рэдка двое цялят. Пародная карова дае 4—5 тыс. *кг* малака за год (тлушчу 3,2—5%, бялку 2,6—4,5%). Б. р. ж. належыць да *жвачных*: ператраўляе корм, багаты на клятчатку (сена, салому, зялёны корм, сілас), караняплоды, брагу, жамерыны і г. д. Дае каштоўныя харч. прадукты — малако і мяса (ва ўмовах Беларусі да 70% валавой прадукцыі жывёлагадоўлі), сыравіну для лёгкай прамысл., гной для с. гасп. У 1969 Б. р. ж. ва ўсім свеце было каля 1 млрд. галоў. (Пра пагалоўе Б. р. ж. ў СССР і БССР гл. табл. 1 і 2.)

Вялікае значэнне для планавага развіцця жывёлагадоўлі ў нашай краіне меў дэкрэт аб племянной рабоце (1918), падпісаны У. І. Леніным. У Расіі ў 1916 было 58,4 млн. галоў нізкапрадукцыйнай Б. р. ж. Племянной жывёлы было мала. За гады Сав. улады ў СССР выведзены новыя высокапрадукцыйныя пароды (чорна-пярэстая, кастрамская, лебядзінская, сычоўская і інш.), старыя айчынныя пароды значна палепшаны. У саўгасах амаль уся жывёла пародная, у калгасах пародная жывёлы больш за 75%. Вытв. малака ў СССР (тыс. *т*) 82 052 (1968), у БССР 5287,9 (1969).

Табліца 1.

Пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў СССР (ва ўсіх катэгорыях гаспадарак на 1 студз., млн. галоў)

Гады	1941	1946	1953	1963	1968	1969
Буйная рагатая жывёла	54,8	47,6	55,6	87,0	97,2	95,7
у т. л. каровы	28,0	22,9	24,3	38,0	41,6	41,2

Табліца 2.

Пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў БССР (ва ўсіх катэгорыях гаспадарак на 1 студз., тыс. галоў)

Гады	1951	1961	1966	1967	1968	1969
Буйная рагатая жывёла	2746	3666	4704	5099	4892	4841
у т. л. каровы	1382	2037	2364	2483	2504	2511

У залежнасці ад гасп.-каштоўных якасцей адрозніваюць пароды: малочнага кірунку (*халмагорская, чорна-пярэстая, яраслаўская, бурая латвійская, галандская, джэрсейская, эстонская чорна-пярэстая*, чырвоная стэпавая і інш.), малочна-мяснога (*кастрамская, сіментальская, сычоўская, швіцкая* і інш.), мяснога (*герэфордская, абердзін-ангуская, шорторнская* і інш.). На Беларусі раяніравалі і гадуюць высокапрадукцыйныя пароды малочнага кірунку (чорна-пярэстая — Мінская, Гомельская, Брэсцкая вобл.; бурая латвійская — Віцебская, Мінская, Гродзенская вобл.; *чырвоная беларуская народная група* — Гродзенская вобл.) і малочна-мяснога кірунку (швіцкая — Віцебская і Магілёўская вобл.; сіментальская — Гомельская і Брэсцкая вобл.; кастрамская — Магілёўская вобл.). Ілюстрацыі гл. на ўклейцы.

Літ.: Скотоводство. Крупный рогатый скот, т. 1—2, М., 1961; Лискун Е. Ф. Крупный рогатый скот, М., 1951; Гайко А. А., Тувов С. П. и Гринь М. П. Красный белорусский скот, Мн., 1968; Карелин В. Н. Совершенствование породы крупного рогатого скота методом разведения по линиям, Мн., 1962; Гайко А. А. і інш. Племянная работа з планавымі пародамі сельскагаспадарчай жывёлы Беларускай ССР, Мн., 1960.

А. А. Гайко, Жодзіна.


БУЙНЕВІЧ Павел Мікалаевіч [н. 15(28).10.1912, в. Ніжнія Грамыкі Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Напярэдадні Айч. вайны працаваў у калгасе. Летам 1941 у складзе знішчальных батальёнаў абараняў Гомель. Потым у партыз. атрадзе імя Пажарскага, які ўвосень 1943 злучыўся з часцямі Сав. Арміі. У ліст. 1943 камандзір гарматы Б. удзельнічаў у вызваленні Гомеля. Вызначыўся ў баях пры прарыве абароны ворага на зах. бераве Віслы ў студз. 1945. Агнём гарматы знішчыў 5 варожых агнявых кропак, 2 станковыя кулямёты. Жыве ў Гомелі.



БУЙНІЦКАГА ТЭАТР, гл. *Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага*.

БУЙНІЦКАЯ БІТВА 1595, антыфеадальнае выступленне на Беларусі. Адбылася каля Магілёва, недалёка ад в. *Буйнічы* ў час антыфеад. сялянска-казацкага паўстання 1594—96 пад кіраўніцтвам С. *Налівайкі*. У снеж. 1595 паўстанцкі атрад Налівайкі (больш за 2 тыс. казакоў, сялян, гарадской беднаты, мяшчан) сустрэўся на Буйніцкім полі з 18-тысячным конным войскам польска-літ. магнатаў на чале з рэчыцкім старостам М. Буйвідам. Паўстанцы абкружылі свой атрад радамі вазоў, утварыўшы т. зв. табар. Гарматным і ружэйным агнём яны цэлы дзень мужна адбівалiся ад ворага і не далі яму наблізіцца да табара. Войска Буйвіда мела вял. страты і адступіла. З-за недахопу сіл паўстанцы знялі табар і позна вечарам рушылі на Пд да Быхава і Рэчыцы.

БУЙНІЦКІ Ігнат Цярэнцьевіч [10(22).8.1861, в. Палівачы Празароцкай вол. Дзвінскага пав. Віцебскай губ.— 9(22).9.1917], беларускі акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч. Стваральнік нац. прафесійнага т-ра (гл. *Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага*). Вучыўся ў Рызе, працаваў камернікам. Гэта зблізіла яго з сялянамі, а любоў да мастацтва, добрае веданне звычаяў народу і яго творчасці прывялі Б. да стварэння тэатра, спачатку аматарскага (1907), а пасля прафесійнага (1910). Б. многа ездзіў з трупай па Беларусі і за яе межамі. Выступаў у Вільні, Пецярбурзе і Варшаве. Кіраваў тэатрам, падтрымліваў яго эканамічна за кошт даходаў са свайго маёнтка, ставіў п'есы, іграў ролі герояў — Аляксей («У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі), Ігнась («Модны шляхцюк» К. Каганца), Антон («Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага), камічныя ролі — Міранovіч («Па рэвізіі» Крапіўніцкага). Асабліва вызначаўся Б. тэмпераментным выкананнем бел. нар. танцаў. Для свайго т-ра збіраў узоры нар. вопраткі, арнаменту, роспісу, залучаў для ўдзелу ў пастаноўках таленавітых выканаўцаў-сялян; пястомна прапагандаваў бел. т-р, арганізоўваў аматарскія гурткі. З-за праследаванняў царскіх улад і матэрыяльных цяжкасцей у 1913 тэатр спыніў дзейнасць. У 1917 Б. вярнуўся да актыўнай тэатр. дзейнасці і стаў адным з ініцыятараў стварэння *Першага таварыства беларускай драмы і камедыі*. Памёр у Маладзечне, пахаваны на радзіме. Б. залажыў асновы сучаснага бел. тэатр. мастацтва. Яго лічаць «бацькам бел. т-ра».



Літ.: Нлфёд У. Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі, Мн., 1959, с. 89—107; Да стагоддзя з дня нараджэння І. Ц. Буйніцкага, у зб.: Беларускае мастацтва, в. 3, Мн., 1962.

А. К. Саннікаў. Мінск.

БУЙНІЧЫ, вёска ў Цішоўскім с/с Магілёўскага р-на, на Дняпры. За 3 *км* на ПдЗ ад Магілёва, 2 *км* ад чыг. ст. Буйнічы, на шашы Магілёў — Бабруйск. 881 ж., двароў 272 (1970). Сельскае прафесійна-тэхн. вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, сярэдняя, вячэрняя сярэдняя і музычная школы, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У пач. 16 ст. Б. належалі Кіева-Пячэрскаму манастыру, пазней кн. Сапегам. Каля Б. адбылася *Буйніцкая бітва 1595*. Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй (1772—95) Б. перададзены ў валоданне бел. намесніку Пасеку. У Вял. Айч. вайну каля Б. адбываліся баі Чырв. Арміі супраць ням.-фаш. захопнікаў. Адзін з іх апісаны К. Сімanавым у рамане «Жывыя і мёртвыя». На месцы баёў помнік-абеліск абаронцам Магілёва ад ням.-фаш. захопнікаў.

БУКАВІНА, гістар. назва тэрыторыі, паўночная частка якой уваходзіць у Чарнавіцкую вобл. УССР, паўднёвая — у Сацыялістычную Рэспубліку Румынію.

У 10—11 ст. Б. ў складзе Кіеўскай Русі, у 12—13 ст. — Галіцка-Валынскага княства, з сярэдзіны 14 ст. — Малдаўскага княства, з 16 ст. — Турцыі, з 1774 — Аўстра-Венгрыі. У ліст. 1918 адышла да Румыніі. У жн. 1940, у выніку мірнага вырашэння канфлікту паміж СССР і Румыніяй, паўн. частка Б., асн. насельніцтва якой украінцы, увайшла у склад УССР.

БУКАНАЎ Іван Аляксандравіч (студз. 1918, в. Новая Казацкая Слабада Казельскага пав. Калужскай губ. — 3.12.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1939, на фронце з чэрв. 1941. Вызначыўся 15.11.1943 на тэр. Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.: кіраваў агонь артыл. батарэі, знішчыў 3 кулямётныя кропкі, у час наступлення сав. пяхоты знішчыў 2 кулямётныя і гарматны разлікі ворага, з 2 байцамі ўварваўся на яго пазіцыі, захапіў гармату і адкрыў агонь па пяхоце і танках непрыяцеля. Загінуў у баі.

БУКАТАЯ Надзея Іванаўна (н. 3.5.1918, в. Траянава Слуцкага пав. Мінскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). У 1934—41 палявод калгаса «Камуніст» Капыльскага р-на Мінскай вобл. З 1944 працуе ў калгасе «Прагрэс» гэтага р-на (з 1953 свінарка). Дэп. Вярх. Савета СССР 5-га скл.

БУКАЎ Эміліян Несцеравіч [н. 15(28).7.1909, г. Кілія Бесарабскай губ.], малдаўскі савецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Чл. КПСС з 1950. Сын садоўніка. Скончыў Бухарэсцкі ун-т (1936). Удзельнічаў у нелегальнай рэвалюц. рабоце. Гнеўныя, поўныя сац. пратэсту і рэвалюц. пафасу творы Б. 30-х г. выдаваліся на сродкі РКП. Першы зб. «Праца кіпіць» (1932) канфіскавала паліцыя. У кн. «Мова сонца» (1937) — крытыка бурж. гр-ва, вера ў светлую будучыню. У Айч. вайну звяртаецца да гістар. тэм («Маці Штэфана»). Пасля вайны адлюстроўвае сацыяліст. пераўтварэнні ў жыцці малд. народа (паэма «Краіна мая», 1947; раман «Растуць паверхі», 1952; раман у вершах «Горад Рэут», 1956). Аўтар вядомай вершаванай казкі «Андрыеш» (1946), зб. «Я бачу цябе, Малдавія» (1942), «Вершы» (1954), «Дзень сённяшні — дзень заўтрашні» (1965), паэм «Час і людзі» (1961), «Песня маладосці» (1968), п'есы «Бурлівы Дунай» (1959), дзіцячай камедыі «Бэп і Дэп»

(1960). Чл. ЦК КП Малдавіі (1956—58), нам. старшыні Савета Міністраў Малд. ССР (1947—51), старшыня праўлення СП Малдавіі (1945—46, 1955—58). Дэп. Вярх. Савета СССР 2-га і 3-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Малдаўскія апавяданні, Мн., 1958; Паэты сонечнай Малдовы, Мн., 1960; рус. пер.— Избранные стихи и поэмы, М., 1960; Человек — Человеку..., Кишинев, 1964; Калейдоскоп. Рассказы, М., 1968; Мой Вьетнам, Кишинев, 1968; Автобиография, у кн.: Советские писатели. Автобиографии, т. 1, М., 1959.

БУКАШНІК (Jasione), род шмат- або двухгадовых травяністых раслін сям. званочкавых. Сцябло доўгагалінастае, выш. 15—80 *см*. Лісце ланцэтна-лінейнае, густа ўкрыта валаскамі. Кветкі блакітныя, радзей белыя. Суквецце — густая галоўка. Вядома 2 віды ў Еўропе, Паўн. Афрыцы і М. Азіі. У СССР адзін — Б. горны (J. montana, нар. назвы: паўночнік, начаквет, начнік, лясная скабіёза). Расце па сухіх пясчаных мясцінах, у хваёвых лясах і на палянах. Лекавая расліна.

БУКВАР, першы падручнік, па якім авалодваюць *граматай*. Доўгі час грамату асвойвалі па царк. кнігах, дзе не было ні паслядоўнасці ў вывучэнні гукаў, ні сістэмы ў падборы слоў, ні прыдатнага для трэніроўкі матэрыялу. З 16 ст. пачалі ствараць і выдаваць спец. дапаможнікі. У Вільні (1593) браты Л. і К. Мамонічы выпусцілі адзін з першых Б. У 1596, таксама ў Вільні, выйшаў Б., які склаў і надрукаваў Л. Зізаній. Па абедзвюх кнігах вучыліся чытаць і пісаць на Беларусі і Украіне, у Расіі і Літве. У 17—19 ст. Б. друкаваліся ў Маскве, Вільні, Куцейне, Магілёве, Супраслі, Варшаве. У 1906 выйшаў «Беларускі лемантар» К. Каганца і «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі. Пасля Кастр. рэв. беларускія Б. выдалі С. Некрашэвіч, А. Федасенка, М. Пігулеўскі і І. Пісарчык, С. Паўловіч і інш. У 1929—69 нашы школы карысталіся Б., складзеным Н. Сіўко (1929—32 з Л. Лукіной, 1937—41 з З. Ліхачовай). З 1969 пачалі вучыцца па Б., які напісаў А. Клышка. *Я. Н. Рапановіч.* Мінск.

БУКВІЦА (Betonica), род шматгадовых травяністых раслін сям. губакветных. Сцябло шарсцістае, выш. 20—100 *см*. Лісце цэласнае, прадаўгаватае. Кветкі цёмна-чырвоныя або ружовыя, часам белыя. Суквецце — густы цыліндрычны кальчак. Вядома 15 відаў, пашыраных у Еўропе, Малой і Сярэдняй Азіі. У СССР 7 відаў, на Беларусі адзін — Б. лекавая (B. officinalis, нар. назвы: златнік, глухая крапіва). Расце на сухіх лугах, у хмызняках і лясах. Мае алкалоіды і дубільныя рэчывы. Лекавая расліна.



Буквіца лекавая: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка.

БУКІНІСТ (франц. bouquiniste ад bouquin старая кніга), прадавец рэдкіх, старадаўніх кніг або кніг, якія былі ў карыстанні.

БУКОЛІКА, букалічная паэзія (ад грэч. bukólos пастух), адзін з малых жанраў антычнай паэзіі. Паказвала побыт пастухоў, апявала харство прыроды; ідэалізуючы вясковае жыццё, проціпастаўляла яго гарадской культуры. Рымская Б. мае нямала падзённых паліт. намёкаў, пераважна ўсхваленне імператараў. Віды букалічнай паэзіі — ідылія, эклога, пастараль. Самыя вядомыя букалісты — Феакрыт і *Вергілій*. Б. была пашырана ў эпоху Адраджэння, а таксама сярод класіцыстаў і сентыменталістаў.

БУКСІРНАЕ СУДНА, буксір (ад гал. boegseren буксіраваць), самаходнае судна, прызначанае для буксіроўкі на тросе або штурханнем баржаў, плытоў і плывучых збудаванняў. Паводле тыпу рухавікоў Б. с. падзяляюцца на параходы, цеплаходы і электраходы, паводле тыпу рухальнікаў — на вінтавыя, колавыя, з крыльчатымі рухальнікамі, паводле месца плавання — на рачныя, марскія, рэйдавыя (партовыя).

БУКЧА, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны памежнік». За 65 *км* на З ад Лельчыц, 280 *км* ад Гомеля, 74 *км* ад чыг. ст. Алеўск (УССР). 1742 ж., двароў 416 (1970). Лясніцтва, аддз. хімлясгаса і леспрамгаса, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 5 магазінаў. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 67 яе жыхароў.

БУКШТА Мікалай Васілевіч (н. 5.7.1931, в. Азярцо Косаўскага пав. Палескага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці. Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1962. З 1949 трактарыст Іванцэвіцкай МТС Брэсцкай вобл., з 1958 у калгасе «Бальшавік» Іванцэвіцкага р-на.

БУКШТЫНАЎ Фёдар Іванавіч [н. 23.12.1903 (5.1.1904), в. Слабада Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. З 1921 на камсамольскай рабоце. З 1927 ва Упраўленні Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі ў Маскве. Напярэдадні Айч. вайны ў ЦК ВКП(б) і Саўнаркоме СССР. З ліп. 1941 у народным апалчэнні, удзельнік абароны Масквы. У партызанах з 15.6.1942. З 1942 камісар *партызанскай брыгады «Чкіст»* і Шклоўскай ваен.-аператыўнай групы; адначасова (з 15.6.1943) сакратар Шклоўскага падпольнага РК КП(б)Б. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

БУКШТЫНОВІЧ Міхаіл Фаміч (1892, в. Жамойдзі Ашмянскага пав. Віленскай губ.— 28.6.1950), савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Віленскае камерцыйнае вуч. (1912). Удзельнік грамада. вайны. У 1918—22 пам. камандзіра, камандзір палка, брыгады. Скончыў курсы «Выстрал» (1924) і курсы ўдасканалення вышэйшага каманднага саставу пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1927, 1931). З кастр. 1931 пам. камандзіра, камандзір дывізіі, корпуса. У Айч. вайну камандзір дывізіі, корпуса, нач. штаба арміі. Удзельнік баёў на Калінінскім, 2-м Прыбалт. і 1-м Бел. франтах. Часці, якімі камандаваў Б., вызначыліся пры вызваленні Невеля 7.10.1943, у Вісла-Одэрскай аперацыі і ў баях за Берлін 2.5.1945. Пасля вайны працаваў у Міп-ве абароны СССР. Узнаг. ордэнам Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, 2 ордэнамі ПНР.

Н. А. Русак. Мінск; *В. В. Тараканаў.* Падольск.



БУЛАВА, старадаўняя зброя, якая мела форму паліцы з галоўкаю накшталт шара, грушы, васьмігранніка на канцы.

Б. з каменнаю галоўкай знаходзяць у археал. помніках неаліту, з металічнаю — у помніках бронзавага веку. Пазней Б. стала сімвалам улады: у краінах Усходу, Зах. Еўропы в 13 ст.; у Рус. дзяржаве, Вял. кн. Літоўскім, Рэчы Паспалітай з 15 ст.; у запарожскіх казакоў у 16—18 ст. Б.-жазло гетманаў каронных (польскіх), літоўскіх, украінскіх рабілі з серабра; ёй надавалі прыгожыя формы, аздаблялі каштоўнымі камянямі. Адначасова з Б. гетман атрымліваў рангавы (булавінскі) маёнтак. У 1649 В. Хмяльніцкі атрымаў сярэбраную Б. ад польскага караля, а ў 1654 ад рус. цара. Б.-пярнач, ці шастапёр, была адначасова зброяй і палкоўніцкім жазлом.

БУЛАВІН Кандрат Апанасавіч (н. каля 1660 — 7.7.1708), кіраўнік антыфеадальнага сялянска-казацкага паўстання ў Расіі. Гл. *Булавінскае паўстанне 1707—08.*

БУЛАВІНСКАЕ ПАЎСТАННЕ 1707—08, антыфеадальнае сялянска-казацкае паўстанне пад кіраўніцтвам К. А. Булавіна на Доне, у Паволжы і ў суседніх з імі рабнах. Прычынай паўстання было імкненне ўрада вярнуць з Пд беглых сялян памешчыкам. У войска паўстанцаў уліваліся казацкая галота і сяляне Тамбоўскага і Каэлоўскага пав., Левабярэжнай і Слабадской Украіны.

1.5.1708 Булавін заняў Чэркаск, дзе 9.5.1708 выбраны атаманам «усевялікага войска Данскога». Яго атаманы І. Паўлаў, І. Нікрасаў, Л. Хахлач авалодалі Дамітрыеўскам і Царыцынам, асадзілі Саратаў. На Северскім Данцы і ў Слабадской Украіне паспяхова амагаліся атрады С. Дранага, М. Голага і С. Беспалага. Для задушэння Б. п. ўрад стварыў спец. армію (32 тыс. чал.) пад камандаваннем В. У. Далгарукага. У ліп. 1708 Булавін асадзіў Азоў, але не авалодаў ім. У гэты час былі разбіты атрады Дранага і інш. Няўдачы выклікалі незадаволенасць заможных казакоў, якія арганізавалі змову. Каб не трапіць у палон, Булавін застрэліўся. Задушыўшы В. п., царскі ўрад ліквідаваў рэшткі самастойнасці Дона.

Літ.: Лебедев В. И. Булавинское восстание (1707—1708), М., 1967; Булавинское восстание (1707—1708 гг.), М., 1935. *С. Д. Вайтовіч.* Мінск.

БУЛАК Павел Іванавіч [н. 12(25).10.1902, в. Вострава Слонімскага пав. Гродзенскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Удзельнік рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. За паліт. дзейнасць сядзеў у турмах (1930—35, 1936—39) бурж. Польшчы. Напярэдадні Айч. вайны сакратар сельсавета ў Галынцы Зэльвенскага р-на. З сак. 1942 камандзір партыз. групы, якая ў маі 1942 ператворана ў атрад «Перамога»; у снеж. 1943 атрад рэарганізаваны ў *партызанскую брыгаду «Перамога»*, якую ўзначальваў Б. У 1944—46 на сав. рабоце ў Зэльве. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, медалямі. Жыве ў Дзярэчыне Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл.

БУЛАК-БАЛАХОВІЧ Станіслаў Нікадзімавіч [29.1(10.2).1883, маёнтак каля Відзаў — вер. 1939], адзін з кіраўнікоў белагвардзейшчыны ў Расіі. У ліст. 1918 на чале кав. палка Чырв. Арміі перайшоў да белых. Удзельнік паходу Юдзеніча. Намагаючыся ўзначаліць белагвардзейскія сілы ў Прыбалтыцы, у студз. 1920 арыштаваў Юдзеніча. Беларуская рада залічыла яго атрад у сваё «войска». У лют. 1920 на чале «беларускага атрада» перайшоў на бок бурж. Польшчы. У сав.-польскую вайну камандаваў атрадамі, якія фарміраваў эсэр Б. В. Савінкаў. У кастр. 1920 Б.-Б. ператварыў свае атрады ў «рускую добраахвотную армію», якая 6.11.1920 перайшла ў наступленне ўздоўж Прыпяці, 10 ліст. захапіла Мазыр, дзе Б.-Б. абвясціў сябе «галоўнакамандуючым усіх узброеных сіл на Беларусі» і стварыў т. зв. «беларускі ўрад». У канцы ліст. 1920 банды Б.-Б. разгромлены, ён уцёк у Польшчу. Да 1922 арганізоўваў налёты на Сав. Беларусь, якія суправаджаліся знішчэннем насельніцтва, гвалтамі, рабункамі. У 1937—39 добраахвотнік у арміі Франка ў Іспаніі.

Літ.: Грицкевич А. П. Крах контрреволюционной авантюры Булак-Балаховича и эсеро-националистического мятежа в Слуцке (конец 1920), у кн.: Тезисы докладов на научной конференции юридического факультета БГУ, Мн., 1966.

БУЛАНАЎ Пётр Аляксандравіч [н. 18.10 (1.11).1905, г. Віцебск], беларускі савецкі мікрабіёлаг. Д-р біял. н., праф. (1942). Чл.-кар. АН Каз. ССР (1954). Чл. КПСС з 1944. Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1930). Заг. кафедры мікрабіялогіі Алма-Аціпскага заавет. ін-та (1934—61), заг. лабараторыі мікрабіялогіі і нам. дырэктара Ін-та біялогіі АН БССР (1961—64). З 1964 заг. кафедры мікрабіялогіі БДУ. Вывучаў уласцівасці змяінага яду. Вынайшаў процідзныя вакцыны і сываратку, антыбіётык актынаміцын К. Даследаваў мікробныя меланіны, даказаў, што яны маюць шырокі спектр біял. дзейнасці і звязаны з гумусам глебы. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

БУЛАТ (перс. pulad), літая вугляродаістая сталь, якая вызначаецца цвёрдасцю, пругкасцю і вязкасцю. Асаблівасць Б. — узорыстая паверхня. Ідзе на выраб халоднай зброі — шабляў, кінжалаў.

Б. быў вядомы яшчэ Арыстоцелю. Выраблялся ў Індыі пад назвай вуц, у краінах Сярэд. Азіі і ў Персіі — табан, харасан, у Сірыі — дамаская сталь. Вытв. булатнай сталі трымалі ў сакрэце. У Расіі тэхналогію выплаўкі Б. распрацаваў П. П. *Аносаў* на златаустаўскіх з-дах. Ён вызначыў хім. састаў Б., рэжым плаўкі і ахаладжэння, калі пры цвярдзенні металу ўтвараюцца буйныя крышталі-дэндрыты. Пасля траўлення вырабаў з Б. кіслатой, якая раз'ядае міждэндрытныя слаі металу, на цёмным фоне выдзяляецца светлы (часта з чырвоным ці залацістым адлівам) хва-

лісты рэльеф. З канца 19 ст. прамысл. значэння не мае.

БУЛАТ Барыс Адамавіч [н. 11(24).7.1912, Тула], адзін з арганізатараў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1932. На пяты дзень Айч. вайны быў цяжка паранены і трапіў у палон. З 2 таварышамі ўцёк з лагера і вясной 1942 арганізаваў і ўзначаліў у Ліпічанскай пушчы на Гродзеншчыне партыз. атрад «Перамога». У снеж. 1942 атрад увайшоў у *партызанскую брыгаду Ленінскую*. Б. прызначаны яе камандзірам. З крас. 1944 Б.— камандзір *партызанскай брыгады «Уперад»*. Жыве ў Мінску.



Літ.: Люди легенд, в. 3, М., 1968, с. 50—65.

БУЛАТ Сцяпан Герасімавіч [30.5(11.6).1894, в. Слабада-Пырашава Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 24.7.1921], беларускі савецкі дзярж. і парт. дзеяч, журналіст. Чл. Камуніст. партыі з 1919. З сялян. У 1913 экстэрнам здаў экзамены на званне настаўніка нар. школ. Настаўнічаў у в. Дзешчанка Ігуменскага пав. У 1914—15 вучыўся ў Мінскім настаўніцкім ін-це, у 1916 мабілізаваны ў армію. У час акупацыі Беларусі бурж. польшчай вёў падпольную работу ў Мінску, чл. ЦК Беларускай камуністычнай арганізацыі і Паўстанцкага к-та. У 1920 заг. паліт. аддзела Наркамата асветы БССР, рэдактар газ. *«Савецкая Беларусь»*. У лютым 1921 арганізаваў выданне сялянскай газ. «Белорусская деревня» (гл. *«Беларуская вёска»*). З мая 1921 сакратар ЦБ КП(б)Б і заг. аддзела агітацыі і прапаганды. Памяці Б. прысвечаны верш Я. Купалы «На смерць Сцяпана Булата», яго імя прысвоена 31-й сярэдняй школе ў Мінску.

БУЛАТАЎ Васіль Галямавіч (н. 15.9.1921, с. Ніжні Чэтай каля Балтасі Татарскай АССР), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў кулямётна-мінамётнае вуч. (1944), Казанскі ун-т (1961). Вызначыўся ў баях пры пераправе цераз р. Друць і прарыве варожай абароны каля Рагачова Гомельскай вобл. На чале кулямётнага ўзвода фарсіраваў раку, зайшоў у тыл непрыяцеля і знішчыў некалькі варожых агнявых кропак. Жыве ў Казані.

БУЛАЎКА Арсен Рыгоравіч [н. 12(25).7.1911, в. Цытва Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне гідралогіі. Аўтар прац па пытаннях воднага балансу рэк Беларусі і ўплыву асушэння балотаў на сцёк рэк. Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Вял. Айч. вайны. Скончыў БДУ (1954). Канд. тэхн. н. (1960), ст. навук. супрацоўнік, заг. аддзела гідралагічных даследаванняў НДІ водных праблем (Мінск). У 1933—39 кіраўнік Паўд.-беларускай гідралагічнай станцыі (басейн р. Ведрыч). Узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Влияние осушения болот на элементы водного баланса рек Белорусского Полесья, М., 1961; (разам з М. Ц. Булаўкай) Характеристика жесткости и агрессивности речных вод Белоруссии, Мн., 1965.

БУЛАХАЎ Дзяніс Рыгоравіч [н. 23.11(6.12).1905, в. Ольгаўка Калачынскага пав. Омскай губ.], перадавік будаўніцтва. Герой Сац. Працы (1958). Удзельнік Айч. вайны. У 1931—34 удзельнічаў у буд-ве Кузнецкага металург. камбіната. У 1946 узначаліў брыгаду мулярaў буд. трэста № 4 Галоўмінскбуда. З 1949 брыгадзір комплекснай брыгады будаўнікоў. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі. Ганаровы грамадзянін г. Мінска.



Тв.: Строим город, Мн., 1961.

БУЛАХАЎ Міхаіл Гапеевіч (н. 22.7.1919, в. Маслакі Горацкага пав. Магілёўскай губ.), беларускі савецкі мовазнавец. Д-р філал. н. (1966), праф. БДУ (1967). Чл. КПСС з 1944. З сялян. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1940). Удзельнік Айч. вайны. Працаваў у Мінскім пед. ін-це (1949—51), Ін-це мовазнаўства АН БССР (1951—65), з 1965 у БДУ. З 1969 гал. рэдактар час. «Веснік БДУ. Серыя IV. Філалогія. Журналістыка». Сааўтар «Граматыкі беларускай мовы» (т. 1—2, 1962—66), падручнікаў і дапаможнікаў па бел. мове для пед. вучылішчаў і ВНУ, аўтар артыкулаў па слав. мовазнаўстве. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Развіццё беларускай літаратурнай мовы у XIX—XX ст. ва ўзаемаадносінах з іншымі славянскімі мовамі, Мн., 1958; Прыметнік у беларускай мове, Мн., 1964.

БУЛАХОЎСКІ Леанід Арсенавіч [14(26).4.1888, Харкаў — 4.4.1961], украінскі савецкі мовазнавец. Акад. АН УССР (1939), чл.-кар. АН СССР (1946). Засл. дз. нав. УССР (1941). Скончыў Харкаўскі ун-т (1910). Праф. Пермскага (1917), Харкаўскага (1921), Маскоўскага (1943—44) ун-таў. З 1944 дырэктар Ін-та мовазнаўства АН УССР. Распрацоўваў гісторыю рус. літ. мовы, пытанні агульнага мовазнаўства, акцэнталогіі і аналогіі слав. моў (рус., укр., чэш., балг., сербскай і інш.). Даследаваў укр. мову, яе арфаграфію і пунктуацыю. Аўтар дапаможнікаў для ВНУ («Курс рускай літаратурнай мовы», т. 1, 5 выд., 1952; «Гістарычны каментарый да рускай літаратурнай мовы», 5 выд., 1958; «Уводзіны ў мовазнаўства», ч. 2, 1953).

Тв.: Питання походження української мови, Київ, 1956; Нариси з загального мовознавства, 2 вид., Київ, 1959.

Літ.: Білодід І. К. Леонід Арсенійович Булаховський, Київ, 1968.

БУЛГАК Ян (6.10.1876, в. Асташына Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 4.2.1950), беларускі і польскі этнограф, фалькларыст, майстар мастацкай краязнаўчай фатаграфіі. Да 1912 жыў у в. Перасека Мінскага пав. У 1919—39 кіраўнік лабараторыі маст. фатаграфіі пры Віленскім ун-це. Заснавальнік і старшыня фотаклуба Польшчы, Віленскага фотаклуба, саюза польскіх мастакоў-фатографаў, польскага фатаграфічнага т-ва. Апублікаваў шмат здымкаў бел. краявідаў, вёсак, гасп. пабудоў, бел. сялян у розных этнагр. выданнях і ў час. «Ziemia» («Зямля»), «Kwartalnik Litewski» («Літоўскі квартальнік»), «Wieś ilustrowana» («Ілюстраваная вёска») і інш. Найб. вядомыя фота: «Беларус з-пад Клецка», «Бабулька-беларуска з маёнтка Перасека пад Мінскам», «Жабракі беларусы пад Мінскам», «Беларуская дзяўчына з-пад Клецка ў народным убранні», «Беларуска з-пад Клецка ў народным строі з самаробнага сукна» і інш. Аўтар артыкулаў пра бел. фальклор і краязнаўства: «Велікодныя песні на Міншчыне (валачоннікі)», 1911, «Экскурсія на Свіцязь», 1910, і інш.; прац пра мастака Ф. *Рушчыца* (1939). Фотатэка і калекцыя здымкаў Б. (каля 10 тыс.) загарэла ў 1944 у Вільні. Пісаў даследаванні і падручнікі па эстэтыцы і тэхніцы фатаграфіі («Фатаграфіка». 1931), краязнаўстве, мастацтве.



Беларуская дзяўчына з-пад Клецка; жабракі беларусы пад Мінскам. (Фота Я. Булгака.)

Тв.: Moja ziemia, Wilno, 1919; Dwadzieścia sześć lat z Ruszczycem, Wilno, 1939.

Літ.: Grabowski L. Jan Bułhak, Warszawa, 1961. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

БУЛГАКАЎ Мікалай Паўлавіч [9(22).11.1907, г. Ліўны Арлоўскай губ.— 19.2.1969], беларускі савецкі вучоны-глебазнавец. Канд. с.-г. н. (1941). Скончыў Беларускую с.-г. акадэмію (1932), працаваў у Беларускім НДІ аграглебазнаўства. Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1957 заг. аддзела геаграфіі і картаграфіі глебаў НДІ глебазнаўства, з 1962 нам. дырэктара па навук. рабоце ў гэтым ін-це. Аўтар больш як 50 прац па глебазнаўстве і земляробстве (вапнаванне, арган. і мінер. ўгнаенні, мікраэлементы, генезіс глебаў, методыка складання глебавых картаў, аграглебавае раянiраванне БССР, вырашэнне праблемы Палесся і інш.), кіраваў буйнамаштабным даследаваннем глебаў Беларусі (1957—64), складаннем раённых глебавых картаў і нарысаў. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: (Разам з Мядзведзевым А. Р.) Глебавы нарыс паўночнай часткі БССР (Віцебшчыны і Полаччыны), Мн., 1933; (у сааўт.) Почвы БССР, Мн., 1952.

БУЛГАКОЎСКІ Дзмітрый Гаўрылавіч (1845 — г. см. невяд.), беларускі этнограф і краязнавец 2-й пал. 19 ст. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1869). У 1902 злажыў в сябе сан святчэнніка. Працаваў настаўнікам рус. і царк.-слав. моў у Ваўкавыску, Пінску. Вывучаў гісторыю, пар. культуру і побыт беларусаў. Напісаў «Гістарычны нарыс Ваўкавыска», «Дапаможнік па рускім правапісе», працы царкоўна-рэліг. зместу. Друкаваў артыкулы і фальклорныя творы ў час. «Новое время», газетах «С.-Петербургские губернские ведомости», «Виленский вестник», «Минские губернские ведомости». Гал. праца — фальклорна-этнаграфічны зборнік «Пінчукі», які з'яўляецца каштоўнай крыніцай вывучэння побыту і вусна-паэтычнай творчасці беларусаў 2-й пал. 19 ст.

Тв.: Пинчуки. Этнографический сборник, СПб., 1890.

Літ.: Довнар-Запольский М. «Пинчуки», [рец.], «Этнографическое обозрение», СПб., 1891, кн. 11, № 4. *В. К. Бандарчык.* Мінск.

БУЛГАРЫЯ, гл. *Балгарыя Волжска-Камская.*

БУЛЕВА АЛГЕБРА, гл. *Алгебра логікі.*

БУЛЕВІЧЫ, род літоўскіх князёў. У рускаліт. дагаворы 1219 упамінаюцца тры браты Б.— Віцімут, Едзівіл і Спрудэйк. Мяркуюць, што Б. жылі на правым беразе верхняга цячэння Нёмана. *Міндоўг*, уладанні якога былі на левым беразе Нёмана, імкнучыся пашырыць сваю ўладу на інш. тэрыторыі Літвы і захапіць іх, знішчыў Б.

БУЛЕЎСКАЕ БАЛОТА (Булеў Мох), у Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл., на У ад р. Случ, на З ад в. Замошша каля воз. Чырвонае. Узнікла ў пач. галацэну (да ўзнікнення возера, якое падсцілаецца гіпнавымі імхамі) ад затарфавання вял. карытападобнага паніжэння. Балота нізіннае, месцамі мяшанае. На З растуць кустовая бяроза, асака, гіпнавыя і сфагнавыя імхі, на У ў апошнія дзесяткі гадоў хвоя і бяроза, ва ўрочышчы «Камар-Мох» расліннасць вярховага тыпу (хвоя, верасовыя, падвей і сфагнавыя імхі). Пл. 25 884 *га*, сярэдняя магутнасць торфу 2 *м*, найб. 6 *м*. Запасы больш як 345 млн. $м^3$. Тарфянік складзены з асаковага, трыснягова-асаковага, асакова-гіпнавага, а ў перыферыйнай зоне з лясного торфу. Выкарыстоўваецца для здабычы торфу на паліва, часткова як пасяўная плошча.

БУЛІНСКІ Андрэй Аляксандравіч [н. 29.12.1909(11.1.1910), Варонеж], беларускі савецкі кінааператар. Засл. дз. маст. БССР (1964). Чл. КПСС з 1949. Пасля заканчэння ў 1931 Сярэднеазіяцкага політэхн. ін-та (Ташкент) аператар студыі «Узбекфільм». Зняў фільмы: «Аазіс у пясках» (1931), «Ташкент — горад брудны» (1932), «Калодзеж смерці» (1934), «Егіт» (1936), «Дарога без сну» (1947). З 1935

на кінастудыі «Беларусьфільм». Аператар фільмаў: «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (1936), «Дзеці партызана» (1954), «Зялёныя агні» (1956), «Нашы суседзі» (1957), «Першыя выпрабаванні» (2 серыі, 1960—61), «Масква — Генуя» (1964, Дзярж. прэмія БССР 1965), «Тысяча вокнаў» (1968). У 1948 зняў на Ашхабадскай студыі фільм «Далёкая нявеста» (Дзярж. прэмія СССР 1949). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».



БУЛЫГІН Іван Андрэевіч [н. 28.1(10.2). 1907, в. Радушкава Ельнінскага пав. Смаленскай губ.], беларускі савецкі фізіёлаг, заснавальнік беларускай школы фізіёлагаў. Акад. АН БССР (1959, чл.-кар. 1956), д-р біял. н. (1952), праф. (1954), засл. дз. нав. БССР (1967). Чл. КПСС з 1940. Скончыў Ленінградскі вет. ін-т (1931), аспірантуру па фізіялогіі (1938). Старшы навук. супрацоўнік Ін-та эксперыментальнай медыцыны (1938—48), Ін-та ЦНС АМН СССР (1948—50), Ін-та фізіялогіі АН СССР (1950—53) у Ленінградзе. З 1953 дырэктар Ін-та фізіялогіі АН БССР і заг. лабараторыі агульнай фізіялогіі, акад.-сакратар Адд. біял. навук АН БССР (1969). У 1935—53 вывучаў функцыянальныя сувязі кары вялікіх паўшар'яў са страўнікам і кішэчнікам, выявіў некат. заканамернасці інтэрацэптыўных уплываў на рэфлекторную дзейнасць спіннога і галаўнога мозгу. У 1954—70 сфармуляваў палажэнне пра некалькі тыпаў цэласных рэакцый арганізма; вылучыў і эксперыментальна абгрунтаваў новыя ўяўленні пра адчувальныя шляхі ўнутраных органаў, пра функцыі вегетатыўных гангліяў; паказаў асаблівасці адчувальнага звяна рэфлексаў з унутраных і знешніх органаў і іх прадстаўніцтва ў кары галаўнога мозгу; вызначыў ланцуговыя і кольцавыя нейра-гуморальныя механізмы рэакцый унутраных органаў, сасудаў і вегетатыўных гангліяў. Чл. Міжнар. арг-цыі па даследаванні мозгу пры ЮНЕСКО (з 1962), старшыня Бел. і чл. прэзідыума Усесаюзнага фізіял. т-ваў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Исследование закономерностей и механизмов интероцептивных рефлексов, Мн., 1959; Замыкательная и рецепторная функции вегетативных ганглиев, Мн., 1964; Афферентные пути интероцептивных рефлексов, Мн., 1966; Особенности афферентного звена интероцептивных и экстероцептивных рефлексов, у кн.: Нейрогуморальные механизмы регуляции функций, Мн., 1965.

БУЛЬБА (Solanum tuberosum), шматгадовая (у культуры звычайна аднагадовая) травяністая расліна сям. паслёнавых; важная харчовая, тэхн. і кармавая с.-г. культура.


Радзіма Б. — Паўд. Амерыка (берагі Чылі і горы Перу). У Расію завезена ў 1-й пал. 18 ст. Як палявая культура пачала вырошчвацца з сярэдзіны 19 ст. Каб вывучыць відавую разнастайнасць Б., знайсці новыя селекцыйныя матэрыялы, па ініцыятыве М. І. *Вавілава* ў 1922—40 арганізаваны экспедыцыі ў Паўд. і Цэнтр. Амерыку. У выніку іх выяўлена 16 новых відаў, атрыманы багатыя першапачатковыя каштоўныя матэрыялы для міжвідавой гібрыдызацыі. Апрача звычайнай еўрапейскай Б., вядома больш за 170 клубняносных відаў, пашыраных у Паўд. і Цэнтр. Амерыцы.

Куст культурнай Б. выш. 50—100 см, мае 4—8 сцяблоў. У падземнай частцы — каранёвая сістэма і сцябловыя парасткі (сталоны), на канцах якіх фарміруюцца клубні розных формы і колеру (белыя, чырвоныя, фіялетавыя з розным адценнем). На клубнях па спіралі размешчаны *вочкі*. Лісце Б. складанае, перарывіста-няпарнаперыстае; кветкі пяціпялёсткавыя, двухполыя, белыя, чырвона-фіялетавыя, сіняя, сіне-фіялетавыя. Суквецце — шчыток. Плод — зеленавата-белая, шматнасенная двухгняздовая ягада. Размнажаецца Б. пераважна вегетатыўным спосабам (клубнямі і іх часткамі). З насення бульбу вырошчваюць толькі ў селекцыі пры вывядзенні новых сартоў. У клубнях у сярэднім 75—80% вады, 12—26 крухмалу, 2—3 бялку, каля 0,3 алею, 1% клятчаткі, многа вітамінаў, асабліва вітаміну С, мінер. соляў і арган. к-т. Б.— цяпло-, святло- і вільгацелюбная расліна. Добра расце на лёгкіх угноеных пясчаных, супескавых і суглінкавых глебах, на асушаных, някіслых тарфяніках. У севазваротах Б. садзяць пасля азімых збожжавых, шматгадовых траў, злакабабовых сумесяў. Шырока практыкуюць квадратна-гнездавы спосаб пасадкі. Асн. хваробы і шкоднікі Б.: *фітафтароз*, рак (гл. *Рак расліn*), *рызактаніёз*, *макраспарыёз*, парша (гл. *Парша расліn*), *чорная ножка*, *кальцавая гніль*, *каларадскі жук*, бульбяная і сцябловая нематоды (гл. *Нематодныя хваробы расліn*), драцянік (гл. *Шчаўкуны*). Вядома больш як 3000 сартоў Б.: сталовыя — з высокімі кулінарнымі якасцямі, добрымі суадносінамі крухмалу і пратэіну (клубні круглаватыя, з тонкай лупінай, неглыбокімі вочкамі, добра разварваюцца); тэхнічныя — маюць многа крухмалу (не менш як 18%); кармавыя — многа пратэіну; універсальныя. Есць сарты ранніе (вегет. перыяд 80—90 дзён), сярэднеранніе (95—105 дзён), сярэднеспелыя (110—120 дзён), позніе (да 180 дзён). Тэхн. і кармавыя сарты позніе, сталовыя — больш скараспелыя. У БССР раяніраваны сарты Б.: ранняй — *Скараспелка 1*, *Скараспелка 2*, Беларуская ранняя; сярэднеранняй — Аграномічная, *Дзецкасельская*; сярэднеспелай — *Зазерская*, Паўль-Вагнер, Агеньчык, Берліхінген; познеспелай — *Тэмп*, *Кандыдат*, *Лошыцкая*, Фаран, *Разварыстая*, *Ганусаўская*, Остботэ. Усе сарты ракаўстойлівыя. Гл. таксама *Бульбаводства*, ін. на ўкл.

Літ.: Картофель, Мн., 1966; Горелкин Л. И. Пути повышения урожайности картофеля в БССР, Мн., 1962; гл. таксама пры арт. *Бульбаводства*.

П. І. Альсмік. Самахвалавічы, Мінскі р-н.

«БУЛЬБА», беларускі танец. Муз. памер 2/4, тэмп жвавы. Створаны на аснове аднайменнай нар. песні. Упершыню пастаўлены бел. балетмайстрам К. Алексютовічам у 1930. Шырока вядомая пастаноўка І. Майсеева, якая ў



Бульба. 1. Агульны выгляд расліны. 2. Кветка ў разрэзе. 3. Плады. 4. Плод у разрэзе. 5. Скараспелка 1. 6. Скараспелка 2. 7. Дзецкасельская. 8. Зазерская. 9. Берліхінген. 10. Аграномічная. 11. Фаран. 12. Ганусаўская. 13. Лошыцкая. 14. Тэмп. 15. Паўль-Вагнер. 16. Разварыстая. 17. Кандыдат. 18. Остботэ.

жартоўнай форме паказвае пасадку, вырошчванне і ўборку бульбы. Танец у яго харэагр. рэдакцыі (з рознымі адхіленнямі) увайшоў у быт народу, набыў рысы традыцыйнасці.

БУЛЬБА Альгерд (сапр. Яленскі Ян; г. п. і см. невяд.), беларускі пісьменнік і крытык. Чл. рэдакцыі газ. «Наша ніва». Выступаў з артыкуламі пра В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалу, Я. Коласа, Т. Шаўчэнку. Маст. творчасць Б. ідэйна-тэматычна ўзбагачала раняе бел. алегарычнае апавяданне («Пад шум восенных дажджоў...», 1910). Аўтар этнагр. працы «Колькі слоў аб дзявочай апратцы на Беларусі» (Вільня, 1911). Адстойваў нац. самабытнасць бел. мастацтва, яго рэаліст. накіраванасць, дэмакратызм.

Тв. у зб.: Беларуская дакастрычніцкая проза, Мн., 1965. *Л. С. Голубева.* Мінск.

БУЛЬБАВОДСТВА, галіна земляробства, арганізацыя вытворчасці бульбы на харчовыя, тэхнічныя і кармавыя мэты. Пашырана ў большасці краін свету, ад Крайняй Пн да экватарыяльнага Пд. У 1967 пасяўной плошчы пад бульбаю па зямным шары было больш за 23 млн. *га*; валавы збор — каля 307 млн. *т*. 95% пасеваў сканцэнтравана ў краінах Паўн. паўшар'я. Па плошчы (8,3 млн. *га*) і валавым зборы (101,6 млн. *т*) СССР (1968) належыць першае месца ў свеце. Да Кастр. рэвалюцыі бульба на Беларусі вырошчвалася ўручную і давала нізкія ўраджаі. Хутка развіваецца Б. пачало пры Сав. уладзе (гл. табл.).

Пасяўная плошча і валавыя зборы бульбы на Беларусі


Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак	1913	1940	1945	1965	1969
Пасяўная плошча, тыс. *га*	583,3	929	745,6	1002,7	974,9
Удзельная вага ў структуры пасяўной плошчы, %	12,9	17,8	19,4	16,6	15,9
Ураджайнасць, *ц/га*	69	128	73	121	139
Валавыя зборы, млн. *т*	4,0	11,9	5,4	12,1	13,5
Дзяржаўныя нарыхтоўкі, млн. *т*	—	1,296	0,423	1,157	1,266

Беларусь займае 3-е месца ў СССР па вытворчасці бульбы. У 1968 на харчы пайшло 15,5% ураджаю, амаль 50% на корм жывёле. Астатняя выкарыстана для перапрацоўкі, на насенне і г. д. Працуе *садоўніцтва, агародніцтва і бульбы Беларускі навукова-даследчы інстытут* (пас. Самахвалавічы, Мінскі р-н), дзе пад кіраўніцтвам акад. П. І. *Альсміка* выведзена многа новых сартоў, удасканальваецца тэхналогія вырошчвання бульбы. Высокія і ўстойлівыя ўраджаі збіраюць на тарфяна-балотных глебах. Напр., у саўгасе «Ведрыч» Рэчыцкага і ў калгасе імя БВА Любанскага р-наў на вял. плошчах атрымліваюць па 200—250, а ў асобныя гады па 350 *ц* клубняў з *га*. Тарфяна-балотныя глебы намнога паляпшаюць насенныя якасці бульбы, не патрабуюць арган. угнаенняў, што значна зніжае затраты працы і сабекошт прадукцыі. Павелічэнне валавых збораў бульбы ў рэспубліцы дасягаецца павышэннем ураджайнасці на аснове перадавой агратэхнікі і комплекснай механізацыі. У калгасах і саўгасах БССР, дзе сканцэнтравана 55,6% усіх пасеваў бульбы, амаль поўнасцю механізаваны догляд пасеваў, пасадка на 80%, уборка на 62%. Укараняецца комплексны метад механізаванай уборкі, пагрузкі, сартавання і перавозкі бульбы, які амаль удвая зніжае сабекошт прадукцыі. Сярод мерапрыемстваў, накіраваных на павелічэнне выт. бульбы, важнае значэнне мае спецыялізацыя Б. Калгасам і саўгасам вызначаны цвёрдыя закупачныя цэны на бульбу, якія стымулююць развіццё Б. Гл. таксама *Бульба, Бульбасаджалка, Бульбаўборачныя машыны*, іл. на ўкл.

Літ.: Картофель, Мн., 1966; Новое в картофелеводстве, под ред. Н. А. Дорожкина, Мн., 1967; Возделывание картофеля, Мн., 1966; Комплексная механизация возделывания картофеля, Мн., 1968; Адамов И. И. Семеноводство картофеля, М., 1967; Калачик В. М. Картофель — 250 центнеров с гектара, Мн., 1967; Картофель на Любанщине, Мн., 1968.

Я. П. Крайчанка, Я. В. Курыленка. Мінск.

БУЛЬБАСАДЖАЛКА, машына для механізаванай пасадкі бульбы. Робіць баразну, укладвае клубні і засыпае іх глебай. Выпускаюцца чатырох- і шасцірадковыя. Чатырохрадковая Б. прызначана для квадратна-гняздавой (*см*) 70×70 пасадкі бульбы з аднаразовым унясеннем мінер. або арган. угнаенняў.




Бульбасаджалка СКМ-6.

Асн. часткі Б.: бункер для бульбы, вычарпны апарат, сашнікі, гнеараскідальнік, засыпныя дыскі, нацяжная лябёдка з мерным дротам, якім правешваюць лініі для першага праходу агрэгата. Пасля двух праходаў Б. (у процілеглых кірунках) дрот пераносіцца на 5—6 *м*. Шасцірадковыя Б. прызначаны для пасадкі бульбы ў рад. Адлегласць паміж барознамі 70 *см*. Засяваюць Б. 2,1—2,8 *га/гадз* (чатырохрадковая — 1,4 *га/гадз*). Працуе пераважна з трактарамі класа 1,4 і 3 *т*.

БУЛЬБАЎБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ, агрэгаты для механізаванай уборкі бульбы — бульбаўборачныя камбайны і бульбакапалкі. Бульбаўборачны камбайн — падкопвае градкі, аддзяляе клубні ад глебы і раслінных рэшткаў, накіроўвае клубні ў кузаў транспартнай машыны. На вільготных глебах ужываюцца камбайны з элеватарным сепаратарам, на камяністай глебе — з рэшатам. Выкарыстоўваюцца двухрадковыя камбайны: К-3 (элеватарны), КГП-2 (з рэшатам), ККУ-2 «Дружба» (элеватарнай і рашэцістай мадыфікацый). Працуюць з трактарамі класа 1,4 *т*, а ў цяж-

кіх умовах работы — 3 *т*. Бульбакапалкі — падкопваюць градку, аддзяляюць клубні ад глебы і пакідаюць іх на паверхні поля. У залежнасці ад умоў работы ўжываюцца навясныя двухрадковыя элеватарныя (КТН-2Б) і рашэцістыя (КВН-2, КВН-2М). Працуюць з



Бульбакапалка КТН-2Б.

трактарамі класа 1,4 *т*. На невял. участках і на вільготных гліністы х глебах карыстаюцца адна- радковымі кідальнымі капалкамі КТН-1А. На Беларусі Б. м. выпускае з-д «Ліда сельмаш». *М. М. Канвалаў.* Мінск.

БУЛЬБЯНАЯ ЗАПЯКАНКА (бульбянка), традыцыйная беларуская страва. У вараную і патоўчаную бульбу дадаюць варанае проса, яйкі, паранае малако, перамешваюць і кладуць на патэльню або ў форму. Запякаюць на лёгкім духу ў печы.

БУЛЬБЯНАЯ МУКА, гл. *Крухмал.*

БУЛЬБЯНАЯ НЕМАТОДА, гл. *Нематодныя хваробы раслін.*

БУЛЬБЯНІКІ (бульбяшкі), традыцыйная беларуская страва. Вараную бульбу таўкуць, перамешваюць з яйкамі, смятанай, малаком і робяць невялікія галушкі, т. зв. камы, якія падсмажваюць на гарачай чарэні печы. Добра падпечаныя Б. кладуць у гаршчок-макацёр, заліваюць смятанай і ставяць на лёгкі дух у печ.

«БУЛЬБЯНЫЯ ЗАБАСТОЎКІ» 1906, забастоўкі батракоў і падзённчыкаў на Беларусі ў рэвалюцыю 1905—07. Пачаліся ўвосень 1906 з-за нізкай аплаты працы. Найб. актыўна праходзілі ў Слуцкім, Ігуменскім і Навагрудскім пав. Мінскай губ., Віленскім і Ашмянскім пав. Віленскай губ. і ў Пружанскім пав. Гродзенскай губ. Забастоўшчыкі патрабавалі павялічыць падзённую плату (з 15—20 да 70 кап.) і не дапускалі да работы сялян, нанятых у інш. паветах. Землеўладальнікі пайшлі на ўступкі. Адначасова паліцыя арыштоўвала кіраўнікоў і актыўных удзельнікаў «Б. з.». У Віленскі павет прыслалі казакоў. Пад канец 1906 забастоўкі былі задушаны.

Літ.: Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955, с. 191—192; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962, с. 383—384; Липинский Л. и Лукьянов Е. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900—1907 гг.), Мн., 1968, с. 173—176.

БУЛЬДОЗЕР (ад англ. bulldose разбіваць вялікія кавалкі), 1) землярыйна-транспартная машына. Складаецца з трактара і навяснога прыдарожнага адвалу. Падзяляюцца: паводле канструкцыі базавай машыны — на гусенічныя і колавыя; паводле магутнасці рухавіка ў — на звышцяжкія, цяжкія, сярэднія, лёгкія і малагабарытныя; паводле ўстаноўкі навяснога абсталявання — з паваротным (універсальным) адвалам і непаваротным; паводле сістэмы кіравання — на канатна-блочныя і гідраўлічныя. Б. зразае і перамяшчае грунт на невялікія адлегласці пры планіроўцы мясцовасці, пры збудаванні дарожных насыпаў і засыпцы траншэй, а на пнеўматычным ходзе таксама ачышчае дарогі і пляцоўкі ад снегу. На базе трактара МТЗ-50/52 мінскі з-д «Ударнік» выпускае Б. Д-579 на пнеўматычным ходзе (гл. рыс.). Магырскі з-д меліярац.



машын выпускае гусенічны універсальны бульдозер Д-649 з гідраўлічнай сістэмай кіравання. 2) Адзін з відаў *выгінальных машын.*

Літ.: Домбровский Н. Г. и Гальперин М. И. Землеройно-транспортные машины, М., 1965. *І. В. Леановіч.* Мінск.

БУЛЬЧЫК Сяргей Сцяпанавіч [н. 10(23).11.1909, Мінск], беларускі і рускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1959). У 1937 скончыў студыю БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы), акцёр гэтага т-ра. З 1939 у Заслаўскім калг.-саўг. т-ры, з 1941 у Пінскім абл. т-ры. У 1941—46 у Сав. Арміі. З 1946 у Палескім т-ры імя Я. Купалы, з 1954 у Магілёўскім абл. драм. т-ры. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Выразны вонкавы малюнак, трапныя дэталі вызначаюць сатыр. вобразы, створаныя Б. З роляў у рус. і



заруб. п'есах: Земляніка («Рэвізор» М. Гогаля), Любім Тарцоў («Беднасць не загана» А. Астроўскага), Кутузаў («Даўным-даўно» А. Гладкова), Труфальдзіна («Слуга двух гаспадароў» К. Гальдоні). У нац. рэпертуары: дзед Бадыль, Гудовіч, Туляга («Партызаны», «З народам», «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Шкаляр («Несцерка» В. Вольскага), Лявоніха («Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка), Духоніч («Гады навальнічныя» К. Губарэвіча). Стварыў вобраз У. І. Леніна ў спектаклях «Крамлёўскія куранты» і «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна, «Імем рэвалюцыі» М. Шатрова.

Літ.: Раеўскі А. Сяргей Бульчык, у зб.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.
А. В. Сабалеўскі. Мінск.



С. Бульчык у ролях У. І. Леніна і М. І. Кутузава.

БУМ (англ. boom шуміха), 1) штучнае кароткачасовае ажыўленне ў эканоміцы капіталіст. краін, выкліканае пераважна інфляцыяй, празмерным пашырэннем банкаўскіх крэдытаў, біржавай спекуляцыяй. Характарызуецца павышэннем цэн на тавары, курсаў каштоўных папер на *біржах*, крэдытным махлярствам. Б. выкарыстоўваецца буйнымі манаполіямі для павелічэння прыбыткаў, цесна звязаны з гонкай узбраення, мілітарызацыяй эканомікі. 2) (Перан.) Празмернае, беспадстаўнае ажыўленне вакол якога-н. мерапрыемства, падзеі, дзеяча і інш.

БУМ, гімнастычная прылада для практыкаванняў у раўнавазе — брус на дзвюх стойках.

БУМАГІН Іосіф Раманавіч (1907, Гарадок Віцебскай губ.— 24.4.1945), Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1932. У Чырв. Арміі з мая 1941. Вызначыўся пры штурме г. Брэслаў (Вроцлаў) 24.4.1945. Пад шквальным агнём байцы ўзвода, якім камандаваў лейтэнант Б., атакавалі ворага. З руін цаглянага будынка гітлераўцы адкрылі агонь з 2 кулямётаў, атака захлынулася. Б. знішчыў гранатамі першую агнявую кропку. Калі ў час паўторнай атакі вораг адкрыў кулямётны агонь з амбразуры ў падвале дома, Б. закрыў яе сваім целам. Шлях да наступлення быў адкрыты. Адна з вуліц у Віцебску названа імем Б.



БУМАЖКОЎ Ціхан Піменавіч [4(17).6.1910, пас. Свіягіна Прыморскага краю — снеж. 1941], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1941). Беларус. Чл. КПСС з 1930. Працаваў дырэктарам цагельна-вапнавых з-даў, старшынёй Петрыкаўскага райвыканкома Палескай вобл. З ліп. 1939 першы сакратар Акцябрскага РК КП(б)Б. У чэрв. 1941 арганізаваў і ўзначаліў першы ў раёне партыз. атрад «Чырвоны Кастрычнік», які з асобнымі часцямі Чырв. Арміі 9 дзён стрымліваў наступленне ням.-фаш. войск на р. Пціч; разграміў у в. Воземля штаб ням. дывізіі, знішчыў і захапіў 55 броне- і аўтамашын, 18 матацыклаў. Партызаны атрада выводзілі сав. часці з варожага акружэння, мініравалі і падпальвалі масты. Толькі ў ліпені партызаны на чале з Б. правялі больш за 10 баявых аперацый, знішчылі 30 варожых танкаў, бронемашын і многа інш. ваен. тэхнікі. 1.8.1941 Б. адкліканы ў распараджэнне ЦК КП(б)Б і накіраваны на Цэнтр. фронт начальнікам палітаддзела дывізіі. Загінуў у баі. Першы з сав. партызанаў, якому прысвоена званне Героя Сав. Саюза. У г. п. Акцябрскі Б. пастаўлены помнік, яго імем названа чыгуначная станцыя, адна з вуліц г. п. Акцябрскі.

Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 157—170.
А. В. Сямёнава. Мінск.

БУМЕДЗЬЕН Хуары (н. 1925, г. Гельма), дзярж. і паліт. дзеяч Алжыра. Адукацыю атрымаў ва ун-тах Зітуна (Туніс) і аль-Азхар (Каір). Працаваў выкладчыкам. Актыўна ўдзельнічаў у нац.-вызв. вайне алж. народа супраць франц. каланізатараў, з 1960 начальнік ген. штаба Арміі нац. вызвалення. Пасля абвяшчэння Алж. Нар. Дэмакр. Рэспублікі (вер. 1962) міністр нац. абароны, з вер. 1963 адначасова першы нам. старшыні Савета Міністраў. З 19.6.1965 старшыня Рэвалюц. савета, з 10.7.1965 старшыня Савета Міністраў. У 1963, двойчы ў 1965 і двойчы ў 1967 наведаў СССР з афіц. візітамі.

БУМЕРАНГ, драўляная кідальная прылада, якая, апісаўшы замкнёную крывую, вяртаецца да кідальніка. Формай найчасцей падобная на серп. Ужывалася як баявая і паляўнічая зброя ў Ст. Егіпце, Паўд. Індыі і Паўд.-Усх. Азіі. Б. захаваўся ў аўстралійскіх абарыгенаў.

БУНАК Віктар Валяр'янавіч [н. 10(22).9.1891, Масква], савецкі антраполаг, прафесар (1925). З 1922 працаваў у Ін-це антрапалогіі Маскоўскага ун-та, з 1948 у Ін-це этнаграфіі імя Міклухі-Маклая АН СССР. Навук. працы па праблемах марфалогіі чалавека, антрапаметрыі, антрапагенезу, расазнаўства, паходжання мовы; па антрапалаг. характарыстыцы ўсходнеславянскіх народаў — рускіх, украінцаў, беларусаў.

Тв.: Антропометрия, М., 1941; Антропологические исследования в Южной Белоруссии, у кн.: Антропологический сборник, № 1, М., 1956 (Труды Ин-та этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. Новая сер., т. 33); Череп человека и стадии его формирования у ископаемых людей и современных рас, М., 1959 (там жа, т. 49).

Літ.: Нестурх М. Ф. Виктор Валерианович Бунак, у кн.: Современная антропология, М., 1964 (Труды Московского об-ва испытателей природы, т. 14).

БУНД (ад ням. Bund саюз), нацыяналістычная дробнабурж. апартуністычная арганізацыя, якая аб'ядноўвала паўпралетарскія слаі яўрэйскіх рамеснікаў зах. абласцей Расіі. Называла сябе «Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі». Засн. ў вер. 1897 у Вільні на з'ездзе прадстаўнікоў груп яўрэйскіх сацыял-дэмакратаў Вільні, Мінска, Беластока, Варшавы, Віцебска і рэдакцыі газ. «Арбетэр Штыме». Цэнтр. органы — «Арбетэр Штыме» («Голас рабочага», у Расіі), «Ідзішэр Арбетэр» («Яўрэйскі рабочы», у Жэневе) і інш. Сац. базай Б. былі пераважна яўрэй-рамеснікі, рабочыя саматужных прадпрыемстваў Літвы, Беларусі, Польшчы. Будаваўся Б. паводле нац. прынцыпу, матывуючы гэта спецыфічнасцю інтарэсаў яўр. пралетарыяту. Праграмнаму патрабаванню бальшавікоў аб праве нацый на самавызначэнне Б. проціпастаўляў «культурна-нацыянальную аўтаномію». Б. быў носьбітам нацыяналізму і сепаратызму ў рабочым руху, імкнуўся сумясціць ідэі *сіянізму* з сацыял-дэмакратыяй. На ўсіх этапах дзейнасці займаў апартуніст. пазіцыі ў с.-д. руху, падтрымліваў «эканамістаў», меншавікоў, ліквідатараў, змагаўся супраць бальшавізму. Апартуніст. і нацыяналіст. тэндэнцыі Б., яго прэтэнзіі на права быць адзіным прадстаўніком інтарэсаў яўр. пралетарыяту вострa крытыкаваў У. І. Ленін, падкрэсліваючы, што Б. з самага пачатку адыгрываў ролю ідэйнага паразіта.

На I з'ездзе РСДРП (1898) Б. увайшоў у РСДРП «як аўтаномная арганізацыя, самастойная толькі ў пытаннях, што датычаць спецыяльна яўрэйскага пралетарыяту». На II з'ездзе РСДРП (1903) бундаўцы адстойвалі федэратыўны прынцып будовы партыі. З'езд адхіліў іх дамаганні, і Б. выйшаў з РСДРП. Напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—07 Б. ішоў з меншавікамі, стаяў за супрацоўніцтва з ліберальнай буржуазіяй. Пасля IV (Аб'яднаўчага) з'езду РСДРП (1906) Б. зноў увайшоў у РСДРП, але не выконваў рашэння з'езду пра аб'яднанне сацыял-дэмакратаў на месцах у адзіныя арг-цыі. У гады рэакцыі і рэвалюц. ўздыму Б. садзейнічаў ліквідатарам, удзельнічаў у жнівеньскім антыпартыйным трацкісцкім блоку, у барацьбе супраць рэвалюц. сацыял-дэмакратыі злучыўся з сіянісцкай плынню Паалей цыён (рабочы сіянізм). VI (Пражская) Усерасійская канферэнцыя РСДРП (1912) выключыла бундаўцаў з партыі разам з інш. апартуністамі. У 1-ю сусв. вайну Б. стаяў на пазіцыях сацыял-шавінізму. У 1917 Б. падтрымліваў Часовы ўрад і выступаў на баку ворагаў Кастр. рэвалюцыі. На сваім VIII з'ездзе (снеж. 1917) Б. выпрацаваў тактыку барацьбы супраць Сав. Рэспублікі, патрабаваў стварыць кааліцыйны ўрад. У гады грамад. вайны і замежнай інтэрвенцыі кіраўнікі Б. аб'ядналіся з сіламі контррэвалюцыі, а некат. радавыя члены выступалі за супрацоўніцтва з Сав. уладай. Гэта прывяло Б. да расколу, а потым да самаліквідацыі. На XIII канферэнцыі Б. (5.3.1921, Мінск) частка бундаўцаў прызнала статут і праграму РКП(б) і была прынята ў Камуніст. партыю. Бундаўцы, якія ўступілі ў РКП(б) з мэтаю падрыву яе знутры, на скорым часе былі выключаны з Камуніст. партыі. За мяжою чл. Б. ўдзельнічалі ў розных антысав. арг-цыях. У Зах. Беларусі, як і ва ўсёй бурж. Польшчы, яны расколвалі адзінства рабочага руху, супрацоўнічалі з ППС, змагаліся супраць КПЗБ, на старонках сваіх выданняў вялі антысав. прапаганду, падтрымлівалі белаэмігрантаў, меншавікоў і трацкістаў. Ідэалогію Б., яго згодніцкую палітыку выкрывала Камуніст. партыя.

Літ.: Ленін У. І. Ці патрэбна «самастойная палітычная партыя» яўрэйскаму пралетарыяту. — Апошняе слова бундаўскага нацыяналізму, Тв., т. 6 (Полн. собр. соч., т. 7); яго ж. Максімум бессаромнасці і мінімум логікі, Тв., т. 7 (Полн. собр. соч., т. 8); яго ж. Ці даказала «Правда» сепаратызм бундаўцаў?, Тв., т. 19 (Полн. собр. соч., т. 23); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954, с. 14, 47; История Коммунистической партии Советского Союза, т. 1—3, М., 1964—68; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966; Плеханов Г. В. Ответ нашим непоследовательным социалистам, Соч., т. 13, М. — Л., 1926.

В. І. Яфрамава. Мінск.

БУНЗЕН (Bunsen) Роберт Вільгельм (31.3.1811—16.8.1899), нямецкі хімік. З 1862 замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН. Эксперымент. даследаванні Б. садзейнічалі стварэнню хіміі металаарган. злучэнняў, развіццю электрахіміі і сучаснай фотахіміі. Упершыню атрымаў металічны магній, літый, кальцый, стронцый і барый. Распрацаваў дакладныя метады газавага аналізу. З Г. Р. Кірхгофам паклаў пачатак спектр. аналізу, адкрыў рубідый і цэзій. Стварыў шмат лабараторных прылад.

Літ.: Архангельский П. А. Роберт Бунзен (1811—1899), «Природа», 1937, № 1.

БУНІН Іван Аляксеевіч [10(22).10.1870, Варонеж — 8.11.1953], рускі пісьменнік. З дваран. Супрацоўнічаў у правінц. прэсе (1889—91). Варожа сустрэў Кастр. рэв. У 1920 эміграваў у Францыю. Памёр у Парыжы. Літ. дзейнасць пачаў у 1887 як паэт. Вершы Б., вытрыманыя ў рэаліст. традыцыях рус. паэзіі 19 ст., процістаялі дэкадэнцкай лірыцы (зб. «Лістапад», 1901, Пушкінская прэмія). Пераклаў «Песню пра Гаявату» Г. Лангфела, філас. драмы Дж. Байрана. У ранніх апавяд. («Танька», «На хутары», «У полі», «Антонаўскія яблыкі») і ў аповесці «Сухадол» (1911—12) паказаў голад і пакуты сялянства, распад патрыярх. вясковага жыцця і заняпад дваранскай Расіі. Тэму збяднення сялян, іх цемры і поўнага бяспраўя глыбока распрацаваў у аповесці «Вёска» (1910), у апавяд. «Вясёлы двор», «Захар Вераб'ёў», «Пустазелле». У аповесцях «Браты» (1914) і «Пан з Сан-Франціска» (1915) выкрываў сац. супярэчнасці бурж. гр-ва. У гады эміграцыі творчасць Б. насычана матывамі, павеянымі ўспамінамі пра радзіму («Лапці», «Далёкае», раман «Жыццё Арсеньева», 1930); значнае месца займае тэма трагічнага кахання («Міцева каханне», «Справа карнета Ялагіна», цыкл «Цёмныя алеі»). Стыль Б. вызначаецца тонкім псіхалагізмам і пранікнёным лірызмам. Нобелеўская прэмія 1933.



Тв.: Собр. соч., т. 1—9, М., 1965—67; бел. пер.— Выбранае, Мн., 1958.

Літ.: Воровский В. В., И. А. Бунин, у яго кн.: Литературно-критические статьи, М., 1956; Афанасьев В., И. А. Бунин. Очерк творчества, М., 1966; Михайлов О. Н. Иван Алексеевич Бунин, М., 1967; Бабореко А., И. А. Бунин. Материалы для биографии, М., 1967.

Ф. І. Куляшоў. Мінск.

БУНІЯЦЯН Мікалай Гаўрылавіч [24.8(5.9). 1878 (па некат. крыніцах 7.9.1884), Тыфліс — 13.12.1943], армянскі савецкі архітэктар. Скончыў Пецярбургскую АМ (1914). Да 1924 працаваў у Маскве. У 1924—38 гал. архітэктар Ерэвана. Кіраваў рэканструкцыяй горада (ген. план 1924). Пабудаваў каля 70 будынкаў: гасцініцы «Ерэван» (1926) і «Севан» (1938), сельгасбанк (1930), жылы комплекс на праспекце Леніна (2-я пал. 30-х г.). Педагог (з 1917), даследчык стараармянскай архітэктуры.

БУНЧУК (цюрк.), 1) старадаўняя вайсковая рэгалія ў выглядзе дрэўка з шаром ці вастрыём на верхнім канцы, з пасмамі конскіх валасоў і двума сярэбранымі кутасамі. Меў значэнне сцяга ці сімвала ўлады і знака годнасці турэцкіх пашэй, у 16—18 ст. таксама польскіх, літоўскіх, укр. гетманаў і казацкіх атаманаў. 2) Музычны інструмент (металафон) у некат. вайсковых аркестрах, упрыгожаны дэкаратыўнымі конскімі хвастамі.

БУНЯКОЎСКІ Віктар Якаўлевіч [4(16).12. 1804, мяст. Бара Падольскай губ.— 30.11(12. 12).1889], рускі матэматык. Чл. Пецярбургскай АН (1830, ад'юнкт 1828) і яе віцэ-прэзідэнт (1864—89), ганаровы член многіх рус. навук. т-ваў і ун-таў. З М. В. Астраградскім і П. Л. Чабышовым адыграў значную ролю ў павышэнні навук. ўзроўню выкладання матэматыкі. Асн. працы па тэорыі лікаў, тэорыі няроўнасцей, тэорыі імавернасцей. Быў гал. экспертам урада па пытаннях статыстыкі і страхавання.

Літ.: Прудников В. Е., В. Я. Буняковский — ученый и педагог, М., 1954.

«БУРА», партыз. спец. група Наркамата дзяржаўнай бяспекі (НКДБ) БССР, якая ў Айч. вайну вяла разведвальна-дыверсійную і баявую дзейнасць на акупаванай тэрыторыі Мінскай, Вілейскай і Гродзенскай абл. Закінута (8 чал.) у варожы тыл 17.4.1944. За час баявых дзеянняў пусціла пад адхон 43 эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага, разбіла 154 аўтамашыны, 3 самалёты, 5 танкаў, 18 гармат, узарвала больш за 5 *км* чыг. палатна. Значна папоўнілася мясцовым насельніцтвам. 34 байцы групы злучыліся з часцямі Сав. Арміі 2.7.1944. Камандзіру «Б.» М. А. *Міхайлашаву* прысв. званне Героя Сав. Саюза.

Літ.: Миронов А. Наперекор всему, у кн.: Люди легенд, в. 2, М., 1966, с. 332—339; Михайлашев Н. А. Буря на Вилейщине, «Неман», 1969, № 2. *І. С. Барысаў, П. І. Емяльянаў.* Мінск.

«БУРА І НАЦІСК» («Sturm und Drang»), літаратурны і грамадска-ідэалагічны рух у Германіі 70—80-х г. 18 ст. Назва — ад аднайменнай п'есы Ф. М. Клінгера. Найб. значныя прадстаўнікі: І. В. Гётэ і Ф. Шылер (ранні перыяд творчасці), Клінгер, І. Г. Гердэр, Я. М. Р. Ленц, Х. Ф. Д. Шубарт, І. Г. Фос. Грунтуючыся на традыцыях Г. Э. *Лесінга*, дзеячы «Б. і н.» выступілі супраць прагнілых грамадскіх парадкаў тагачаснай Германіі. Паслядоўнікі Ж. Ж. *Русо*, яны, крытыкуючы пераймальную культуру, звярнуліся да нац. і нар. вытокаў мастацтва. У процілегласць рацыяналізму і нарматывізму класіцыстычнай эстэтыкі адстойвалі аналогію пачуццяў, сентыменталізм, культ У. Шэкспіра. Абстрактнасць і адарванасць ідэалаў ад сац. рэчаіснасці абумовілі крызіс «Б. і н.». Адмоўна ўплывалі на гэты рух містычныя вучэнні І. Г. Гамана, І. К. Лафатэра і Ф. Г. Якобі. Але баявы пафас руху, яго антыфеад. накіраванасць зрабілі «Б. і н.» прагрэс. этапам у развіцці асветніцкай ідэалогіі і л-ры.

Літ.: Сильман Т. Драматургия эпохи «Бури и натиска», у зб.: Ранний буржуазный реализм, Л., 1936; Неустроев В. П. Немецкая литература эпохи Просвещения, М., 1958.

«БУРАВЕСНІК», усесаюзнае студэнцкае добраахвотнае спартыўнае таварыства (СДСТ). Аб'ядноўвае студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікаў ВНУ. Засн. ў 1957, уваходзіць у міжнар. федэрацыю універсітэцкага спорту. Аснова т-ва — спарт. клуб, створаны ў ВНУ студэнцкім прафс. к-там. У Беларускі рэсп. савет СДСТ «Б.» уваходзяць 4 абл. саветы і 26 спарт. клубаў ВНУ. Т-ва мае кваліфікаваныя кадры спецыялістаў — выкладчыкаў фіз. падрыхтоўкі і трэнераў па розных відах спорту. У рэспубліцы «Б.» выхаваў каля 450 засл. майстроў спорту і майстроў спорту СССР, каля 3400 кандыдатаў у майстры спорту і спартсменаў першага разраду. Сярод іх засл. майстры спорту СССР А. Караваеў, М. Крывасаў, А. Мядзведзь; майстры спорту міжнар. класа У. Сапея, У. Урбановіч; майстры спорту СССР А. Валчэцкая, М. Чучалаў і інш. Спарт. клубы т-ва «Б.» на Беларусі маюць 11 комплексных пляцовак, 45 залаў, 86 спарт. пляцовак для ручных гульняў і інш. спарт. збудаванні. У «Б.» развіваюцца 32 віды спорту, ёсць 5 каманд майстроў класа «А» па баскетболе, валейболе, водным пола і ручным мячы (сярод жанчын і мужчын).

А. Л. Каленік. Мінск.

БУРАВЕСНІКІ, трубканосыя (Tubinares, Procellariiformes), атрад марскіх птушак. Маса 0,42—8 *кг*. Апярэнне чорна-белае або бура-белае. Крылы доўгія, вострыя. Дзюба выцягнутая, на канцы кручкападобная, зверху ноздры ў асобных трубачках. Пярэднія пальцы ног злучаны перапонкаю. 24 роды, каля 100 відаў. Пашраны на морах усяго свету, асабліва ў Паўд. паўшар'і. У СССР 14 відаў, сярод іх паўночны Б., танкадзюбы Б., шэрая качурка, белалобы тайфуннік, *альбатросы*. Усе добра лятаюць, трымаюцца адкрытага мора (адпачываюць і сняць на вадзе), на сушы бываюць толькі ў перыяд размнажэння. Кормяцца марскімі беспазваночнымі, мярцвячынай і адкідамі. Гняздуюцца калоніямі. Яйцы кладуць на зямлю або ў шчыліны між камянёў. У негнездавы час трымаюцца чародамі.

БУРАЗЕМЫ, бурыя лясныя глебы. Развіваюцца пад шыракалістымі і мяшанымі лясамі ва ўмовах цёплага вільготнага клімату

ў раўнінных і горных абласцях. Вызначаюцца слабой дыферэнцыяцыяй профілю. У Б. 3—6% перагною, тоўшча перагнойнага гарызонту 5—25 *см*. Рэакцыя слабакіслая, гідралітычная кіслотнасць 4—8 *мэкв* на 100 *г* глебы. Ступень насычанасці асновамі 70—90%; водна-фіз. ўласцівасці і структура глебы спрыяльныя для росту дрэвава-хмызняковай расліннасці. Б. пашыраны ў Зах. Еўропе, Прыбалтыцы, у горных раёнах СССР, на Д. Усходзе. Адрозніваюць насычаныя асновамі і кіслыя. У БССР пераважна кіслыя, пашыраны на З і ПдЗ рэспублікі. Насычаныя асновамі Б. ўрадлівасцю блізкія да чарназёмаў, кіслыя патрабуюць ваппавання.

Т. А. Раманава. Мінск.

БУРАЗУБКІ (Sorex), род дробных звяркоў атр. насякомаедных. Нагадваюць мышэй, але мордачка выцягнута накшталт хабатка. Поўсць аксамітная, цёмна-бурая, зубы чырванавата - бурыя (адсюль назва). Водзяцца ў тундрах, лясной і лесастэпавай зонах Паўн. паўшар'я. Вядома каля 60 відаў. У БССР 3, найб. пашыраны звычайная Б. і малая Б., радзей сярэдняя Б. Кормяцца беспазваночнымі. Сярод Б. самае маленькае з сучасных млекакормячых — Б.-малютка (S. tsherskii). Даўж. ле цела (без хваста) каля 4 *см*.



Звычайная буразубка.

Літ.: Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961 (бібліягр.).

БУРАК Аляксандр Кандратавіч (н. 14.2. 1918, ст. Койданава Мінскага пав.), Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1944. Працаваў слесарам на Мінскім вагонарамонтным з-дзе. Скончыў Мінскі аэраклуб (1938), Адэскую лётную школу (1940). На фронце з 1941. Удзельнік баёў на Бранскім, Калінінскім, 1-м і 4-м Укр. франтах. Зрабіў 128 баявых вылетаў, знішчыў 28 варожых танкаў, 50 аўтамашын, 3 самалёты, 7 складаў з боепрыпасамі, 3 батарэі зенітнай артылерыі, 2 чыг. эшалоны. Служыць у Сав. Арміі.



БУРАК Андрэй Мацвеевіч (1911, ст. Койданава Мінскага пав.— 17.10.1943), Герой Сав. Саюза (1943). У чырв. Арміі з чэрв. 1941, кулямётчык. Вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Ржышчава Кіеўскай вобл. Агнём кулямёта прыкрываў пераправу сав. войск цераз Дняпро. Пераправіўся на захоплены плацдарм, удзельнічаў у адбіванні трох контратак ворага. Загінуў у баі. Пахаваны ў с. Шчучынка Кагарлыцкага р-на Кіеўскай вобл.

БУРАК Самуіл Мендэлевіч (1872, г. Мар'інпаль — 12.3.1938), беларускі савецкі атарыналарынголаг. У 1897 скончыў мед. ф-т Харкаўскага ун-та, у 1902 абараніў дысертацыю на ступень д-ра медыцыны. У 1906—16 заг. ЛОР-лячэбніцы Харкаўскага шпіталя, у 1925—38 заг. кафедры ЛОР-хвароб Мінскага мед. ін-та. Асн. працы па вывучэнні склеромы. Удзельнік міжнар. кангрэсаў у Будапешце (1909) і Мадрыдзе (1932). Старшыня праўлення Бел. асацыяцыі атарыналарынгалагічнага т-ва (1928—38).

Тв.: Склерома верхніх і ніжніх дыхальных шляхоў, Мн., 1933.

Літ.: Ярославский Е. Профессор С. М. Бурак. «Медицинский журнал БССР», 1938, № 3.

БУРАКАВОДСТВА, галіна земляробства, арганізацыя вытворчасці буракоў для цукровай прамысловасці, а таксама на харчовыя і кармавыя мэты. За гады Сав. улады Б. стала развітай галіной с. гасп. Апрача Украіны і цэнтральначарназёмных абласцей, яно пашырана ў Кіргізіі, Казахстане, Грузіі, Паволжы, Алтайскім краі і інш. У 1940 у СССР было пасеяна цукр. буракоў 1,23 млн. *га*. Па плошчы (3 млн. 560 тыс. *га*) і валавым зборы (94 млн. 340 тыс. *ц*) СССР займае 1-е месца ў свеце (1968). У БССР цукр. буракі на тэхн. мэты вырошчваюцца ў пасляваенны перыяд (гл. табл.). Для іх перапрацоўкі ў рэспубліцы пабудавана 4 цукр. з-ды. Усю таварную прадукцыю Б. на тэхн. мэты даюць калгасы, а таксама саўгасы і інш. дзярж. гасп.

Вырошчванне цукровых буракоў у БССР (на тэхнічныя мэты)

	1950	1955	1960	1965	1969
Пасяўная плошча, тыс. *га*	4,6	19,1	29,1	58,7	49,3
Ураджайнасць, *ц/га*	149	42	132	152	187
Валавыя зборы, тыс. *т*	69,4	81,2	383,1	856,2	905,4
Дзяржаўныя нарыхтоўкі, тыс. *т*	36	77	328	768	835


Асноўныя раёны Б. ў БССР: Гродзенскі, Шчучынскі, Бераставіцкі, Мастоўскі, Камянецкі, Пінскі, Пружанскі, Іванаўскі, Капыльскі, Слуцкі, Нясвіжскі, Любанскі. Калгасы «Аснежыцкі» Пінскага, «Авангард» Гродзенскага, імя Калініна Любанскага, імя Куйбышава Івацэвіцкага р-наў і інш. штогод атрымліваюць па 380—400 *ц* буракоў з гектара. Цукровыя буракі выкарыстоўваюцца таксама і на кармавыя мэты: у БССР у 1968 было пасеяна 9,6 тыс. *га*, валавы збор 182,2 тыс. *т*. Апрача цукровых, вырошчваюцца кармавыя і сталовыя буракі.

Першы цукр. з-д у Расіі пабудаваны ў 1802. У 1844 цукр. буракі ў Расіі займалі 50 тыс. *га*, у 1860 — 107,6 тыс. *га*, у 1894 — 401,9 тыс. *га*, у 1913 — 648,7 тыс. *га*. Большасць пасеваў была сканцэнтравана на Украіне і ў цэнтральначарназёмных губернях (Курскай, Варонежскай, Тамбоўскай, Арлоўскай, Тульскай). Больш за 80% плошчы належала цукразаводчыкам і памешчыкам. Б. развіта ў Еўропе, ЗША, Канадзе і інш. Пасяўныя плошчы і валавыя зборы (1967): у ЗША 447 тыс. *га*, 17 млн. 568 тыс. *т*; у Англіі 185 тыс. *га*, 6 млн. 880 тыс. *т*; у Францыі 315 тыс. *га*, 12 млн. 737 тыс. *т*; у ФРГ 294 тыс. *га*, 13 млн. 697 тыс. *т*. Гл. таксама *Буракі, Цукровая прамысловасць*.

Літ.: Доманьков В. М. и Лепешко И. Я. Механизация возделывания и уборки сахарной свеклы, Мн., 1968; Вострухин Н. П., Фолитар И. И. и Печкарева Т. А. Возделывание сахарной свеклы по новой технологии, Мн., 1966; Лашкевич Г. И. Сахарная свекла на торфяных почвах, Мн., 1965; Опыт возделывания сахарной свеклы в Гродненской области, Мн., 1967; Беліч-онак І. М. Волат сярод прапашных, Мн., 1963; Основные выводы научно-исследовательских работ по сахарной свекле за 1966 год, т. 1—2, Киев, 1968.

П. М. Лышчыцкі. Мінск.

БУРАКАЎБОРАЧНЫ КАМБАЙН, машына для механізаванага выкопвання буракоў з абрэзкай бацвіння на корані ці ў машыне. Ва ўмовах Беларусі найб. прадукцыйныя Б. к. маркі СКН-2А. Яны двухрадковыя з міжрадкоўем 45 *см* (гл. рыс.).



Камбайн СКН-2А.

Асн. часткі: бацвіннерэзны апарат, які складаецца з капіраў-палазкоў і сферычных дыскавых нажоў; падоўжны і папярочны прутковы транспарцёры бацвіння; бункер для бацвіння; ачышчальнік буракоў; 2 пары капачоў з дыскамі і лапамі падкопкі; бункер для буракоў; скрабковы элеватар. Гэтыя механізмы змантіраваны на раме з трыма коламі.

Кіруюць Б. к. ад гідрасістэмы трактара. Пры руху камбайна на 2 радках выкопваюцца буракі, у якіх зрэзана бацвінне, а на 2 сумежных радках яно зрэзваецца. Б. к. працуе з трактарам «Беларусь».


БУРАКІ (Beta), род адна- і шматгадовых раслін сям. лебядовых. Вядома 13 відаў дзікіх Б., пашыраных у Закаўказзі, М. Азіі, Іране, Крыме, на Балканах. У СССР 6 відаў, пераважна на Каўказе; культывуецца адзін — Б. звычайныя, якія падзяляюцца на 2 падвіды: лісцевыя (мангольд) і караняплодныя. Яны паходзяць ад дзікарослых галафітных буракоў (B. vulgaris), што растуць на ўзбярэжжах Міжземнага, Чорнага і Каспійскага м., у Сярэд. Азіі, Зах. Еўропе, Кітаі, Індыі, на Канарскіх а-вах, у Каліфорніі.

Культурныя Б.— двухгадовая расліна. На 1-м годзе вырастаюць корань і разетка лісця, на 2-м з перазімавалых (у сховішчах) і высаджаных караняплодаў развіваецца кветаносны парастак, на яго галінах утвараецца насенне (суплоддзі). Лісце сэрцападобнае, чаранковае, з хвалістымі краямі і гладкай або гафрыраванай паверхняй. Кветкі дробныя, зеленаватыя з чырвонай і жоўтай пігментацыяй. Караняплод па вертыкалі дзеліцца на 3 часткі: галоўку (верхняя частка, што нясе лісце), шыйку (сярэдняя, цыліндрычная частка без лісця і каранёў) і сам корань (ніжняя клінападобная частка з бакавымі карэньчыкамі). В. вядомыя з старажытных часоў (6—4 ст. да н. э.) як агародная лісцевая і караняплодная расліна. Шматвяковым адборам з агародных Б. у 18—19 ст. атрыманы культурныя формы сталовых, кармавых і цукровых буракоў.

Цукровыя буракі (B. vulgaris saccharifera), тэхн. культура для атрымання цукру. Выведзены шматразовым адборам з белых агародных буракоў, атрыманых ад прыроднага скрыжавання дзікіх формаў караняплодных буракоў з лісцевымі. Мелі дробныя карані з цукрыстасцю 8—10%, у выніку селекцыйнай работы цукрыстасць павялічылася да 19—20%, у некат. раслін да 24%. Сярэд. маса караняплода 400—500 *г*, асобных да 8—10 *кг*. Форма канічная або мешкападобная. Найб. ўраджаі даюць мешкападобныя карані, найб. працэнт цукру — канічныя формы. Цепла-, святлалюбныя і вельмі патрабавальныя да ўмоў жыўлення і вільгаці, асабліва ў перыяд фарміравання лісця і караняплода (ліп. — жн.). Вегет. перыяд на 1-м годзе 150—170 дзён (у залежнасці ад сорту, агратэхнікі вырошчвання і глебава-кліматычных умоў), на 2-м — 100—130 дзён. Асн. хваробы і шкоднікі: *караняед буракоў, цэркаспароз*, пераноспароз, гніль сардэчка, *кагатная гніль буракоў*, бураковыя мушкі, бураковая муха, бураковая тля, азімая соўка, лугавы матылёк, *даўганосікі*.

Раней вырошчваліся толькі шматнасенныя цукровыя Б., пасяўны матэрыял якіх — суплоддзі-клубочкі. Прарастаючы, кожны клубочак дае па 2—4, а то і больш парасткаў, якія размяшчаюцца скучана, карэньчыкі іх часта пераплятаюцца. Гэта ўскладняе прарыўку, падоўжвае ле тэрмін, што вядзе да значнага недабору ўраджаю, не дае магчымасці поўнасцю вызваліцца ад ручной працы, павышае сабекошт прадукцыі. На Украіне ўпершыню ў свеце сав. селекцыянеры вывелі новую форму цукровых Б., пасяўны матэрыял якіх мае аднанасенныя плодзікі. Прарастаючы, кожны дае адзін парастак. Аднанасенныя цукровыя Б. ураджайнасцю і цукрыстасцю не адрозніваюцца ад раніраваных сартоў шматнасенных буракоў. Гал. перавага аднанасенных Б. — магчымасць слубы аднапарасткавага насення пунктырным спосабам з пэўнай колькасцю насення. Гэта скарачае або выключае ручную працу на прарыўцы і робіць буракі малапрацаёмкай культурай.

Пад цукровыя Б. на Беларусі выкарыстоўваюць сугліністыя і супясчаныя мінеральныя, а таксама добра асушаныя і акультураныя тарфяна-балотныя глебы. У севазваротах размяшчаюць пасля азімых ці бульбы. Сеюць рана, шырокарадковым спосабам, у прагрэтую, добра апрацаваную глебу. Прараджваюць (букетуюць) механізавана. Гэта паскарае прарыўку, змяншае затраты ручной працы і дае магчымасць выкарыстаць квадратнае або квадратна-гнездавое размяшчэнне раслін. Робіцца букетоўка ўпоперак радкоў у фазе развітай «вілачкі» (1—2 пары лісточкаў) пры наяўнасці на адным пагонным метры радка не менш як 30—35 раслін. Пры гэтым ствараюцца ўмовы для падоўжнага і папярочнага догляду пасеваў шляхам механізаванага рыхлення міжрадкоўя. Асн. сарты



Цукровыя буракі: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветканосны парастак; *3* — суплоддзе.

цукр. буракоў, раяніраваных у рэспубліцы: Уладаўскія 752 палепшаныя, гібрыд Ялтушкоўскія аднанасенныя×Уладаўскія 752.

Буракі сталовыя (B. vulgaris esculenta), у агародніцтве культывуюцца ў 2 формах: сталовыя караняплодныя (больш пашыраныя) і Б. лісцевыя — мангольд. Караняплоды бываюць круглыя, круглавата-плоскія, прадаўгавата-авальныя, маюць чырвоны з ружавата-чырвоным да чорна-чырвонага адцення колер. Багатыя на вугляводы (14,4%), розныя солі, вітаміны С, В, РР, арганічныя к-ты. Ужываюцца караняплоды і лісце вараныя, кансерваваныя і сушаныя. Сарты ў БССР: Бардо 237, Егіпецкія плоскія, Пушкінскія плоскія К-18, Холадаўстойлівыя 19.

Буракі кармавыя (B. vulgaris crassa), добры малакагонны корм, багаты на вугляводы, мінер. солі, вітаміны. Караняплоды (цыліндрычныя, круглыя, канічныя) — белыя, ружовыя, жоўтыя, аранжавыя або чырвоныя. Скормліваюцца ўсім відам жывёлы, пераважна малочным. Бацвінне ідзе на корм свежае і сіласаванае. Б. кармавыя садзейнічаюць засваенню грубых і канцэнтраваных кармоў у арганізме жывёл. У БССР раяніраваны і культывуюцца сарты: Экендорфскія жоўтыя, Барэс, Беларускія круглявыя, Паўцукровыя чырвоныя, Пусцукрыныя балтэі. Гл. таксама *Буракаводства*.

Літ.: Сахарная свекла в Белоруссии, Мн., 1963; Красочкин В. Т. Свекла, М. — Л., 1960; Биология и селекция сахарной свеклы, М., 1968; Земледелие и растениеводство в БССР. Сб. научных трудов, т. 12, Мн., 1968.


А. І. Казлоўскі. Жодзіна; І. І. Цішкевіч. Самахвалавічы, Мінскі р-н.

БУРАКОВА, гарадзішча ранняга жалезнага веку *днепра-дзвінскай культуры* (5 ст. да н. э. — сярэдзіна 1-га тысячагоддзя н. э.), якое знаходзіцца за 7 *км* на Пн ад г. Гарадка Віцебскай вобл. Назва паходзіць ад вёскі, якая тут некалі існавала. Даследавана ў 1934 А. М. *Ляўданскім*, у 1964—66 К. П. Шутам. Форма гарадзішча прамавугольная (*м*) 40×30, паўн. схіл умацаваны валамі і равамі. Раскапаны рэшткі жылых пабудоў з бярвення шулавай канструкцыі, жалезаапрацоўчая майстэрня. Знойдзены сякеры, сярпы, накаечнікі стрэлаў, заколкі з завіткамі, каменный кавадлы, бронзавыя ўпрыгожанні, гліняныя прасліцы. Посуд з адзнакамі *тэкстыльнай керамікі культуры*; гаршкі слоікападобнай формы з ямкамі і пракрэсленым па вянчыку арнаментам.

Літ.: Шут К. П. Памятники раннего железного века на севере Белоруссии, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1966.

К. П. Шут. Мінск.

БУРАКОВАЯ СЕЯЛКА, машына для сяўбы калібраванага насення буракоў. Адначасова рассявае мінер. ўгнаенні. Можа сеяць проса, грэчку. Выпускаюцца 12-радковыя Б. с., якія складаюцца з 2 шасцірадковых секцый. Кожная секцыя мае апарат для насення, сашнікі, насеннеправоды, тукавыя апараты з дыскамі. Шырыня захопу 5,4 *м*. Працуе з трактарам,



Бураковая сеялка СТСН-6А.

можа засяваць да 3,85 *га* за гадзіну. Для міжрадкоўя 45 *см* выпускаюцца сеялкі накладнай сяўбы СТСН-6А, 2СТСН-6А, а для 60 *см* — СТСП-6.

БУРАКОВЫ ЦУКАР, гл. *Цукроза*.

БУРАКС (араб. burag салетра), дзесяціводная натрыевая соль тэтраборнай кіслаты, $Na_2B_4O_7 \cdot 10H_20$. Бясколернае крышталічнае рэчыва са слабымі шчолачнымі і антысептычнымі ўласцівасцямі. Шчыльн. 1690—1720 *кг/м*³. Слаба растворваецца ў вадзе. Пры награванні да 350—400 °С атрымліваецца бязводная соль з *t* пл. 741 °С і шчыльн. 2370 *кг/м*³. Прыродны Б. утвараецца ў хім. асадках бараносных саляных азёраў (Каліфорнія, Тыбет і інш.), у адкладах гразевых вулканаў (Таманскі п-аў), а таксама ў мінер. і нафтавых водах. Атрымліваюць Б. з прыродных *баратаў* або ўзаемадзеяннем борнай к-ты з содай. Выкарыстоўваецца ў керамічнай, фармацэўтычнай, папяровай і гарбарнай вытв., у металургіі, пры вырабе антычнага і каляровага шкла і эмаляў, пры пайцы, рэзцы і зварцы металаў, у с. гасп. і медыцыне.

БУРАЛОМ, ветралом, паламаныя моцнымі вятрамі (бурамі) дрэвы ў лесе. Найчасцей ломяцца дрэвы, якія маюць рыхлую і крохкую драўніну, выраслі ў гушчары і пашкоджаны стваловай гніллю. Вывернутыя з каранямі дрэвы ўтвараюць ветравал.

БУРАЎКІН Генадзь Мікалаевіч (н. 28.8.1936, в. Шуляціна Расонскага р-на Віцебскай вобл.), беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1964. Скончыў БДУ (1959). Працаваў у час. «Камуніст Беларусі», на Беларускім радыё, у газ. «Літаратура і мастацтва». З 1968 карэспандэнт «Правды» па БССР. Друкуецца з 1952. Першы зб. «Майская просінь» (1960). Паэзія Б. пафасна-публіцыстычная, тэмпераментна-грамадзянская. Антываен. тэма, асуджэнне міжнар. рэакцыі, выкрыццё мяшчанскай маралі, цікавасць да вострых канфліктаў сучаснасці мяжуюць у Б. з вершамі ўзнёслых патрыят. пачуццяў, з праніклівай споведдзю перад часам і людзьмі, пейзажамі роднага краю і лірыкай інтымных перажыванняў. Выступае і ў прозе. Вершы паэта перакл. на рус., укр., літ., балг., польскую і інш. мовы.




Тв.: Выбраныя вершы, Мн., 1969; З любоўю і нянавісцю зямною, Мн., 1963; Дыханне, [Мн., 1966]; Першая старонка, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.


Літ.: Вугаёў Дз. Дыханне паэзіі, «Маладосць», 1967, № 4; Коваленко В. Дыхание времени, «Дружба народов», 1967, № 7.

А. А. Лойка. Мінск.

БУРАЦКАЯ АЎТАНОМНАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Буряція), у складзе РСФСР. Утворана 30.5.1923. Размешчана на поўдні Усх. Сібіры, на У ад воз. Байкал. Пл. 351,3 тыс. *км*². Нас. 812 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 18 раёнаў; 5 гарадоў, 13 гар. пасёлкаў. Сталіца Улан-Удэ. Канстытуцыя прынята VII Надзвычайным з'ездам Саветаў Бурат-Мангольскай АССР 11.8.1937 і зацверджана Вярх. Саветам РСФСР у 1940. Вышэйшыя органы дзярж. улады — Вярх. Савет Бур. АССР, які выбіраецца на 4 гады (1 дэпутат ад 6000 чал. насельніцтва), а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады: аймачныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя, самоныя і сельскія Саветы дэп. працоўных. Судовая сістэма: Вярхоўны суд Бур. АССР і народныя суды.

Прырода. Паўд.-зах. частку Б. займаюць адгор'і Усх. Саяна. Тут найвышэйшы пункт Б. — г. Мунку-Сардык (3491 *м*). Уздоўж Байкала — Байкальская горная вобл. з хрыбтамі Хамар-Дабан, Улан-Бургасы, Баргузінскі, Ікацкі, Байкальскі, Паўн.-Муйскі, Паўд.-Муйскі і інш. Паўн.-ўсх. частку займае Віцімскае пласкагор'е. Б. багатая на карысныя выкапні — рэдкія і каляровыя металы, жал. руду, баксіты, вугаль, сланцы, графіт, слюду і інш. Зіма марозная, бязветраная і маласнежная, сярэд. т-ра студз. ад −19 да −27 °С. Лета кароткае, цёплае, сярэд. т-ра ліп. ад 8 (у гарах) да 20 °С. Ападкаў 200—500 *мм*, у Прыбайкаллі 500—1200 *мм* за год. Вегет. перыяд 90—155 дзён. Асн. рэкі: Селенга, Баргузін, Верхняя Ангара (упадаюць у Байкал). Бас. Лены належыць Віцім. У Б. адно з найб. азёраў СССР — Байкал. Глебы падзолістыя, на стэпавых участках чарназёмападобныя і каштанавыя. 80% тэр. ўкрыта лесам (лістоў-





Улан-Удэ. Будынак Прэзідыума Вярхоўнага Савета Бурацкай АССР.

ніца, хвоя, кедр, бяроза, піхта і інш.). Прамысл. жывёлы: собаль, навёрка, ондатра, ліс, каланок і інш. На ПнУ ад Байкала — Баргузінскі сабаліны запаведнік.


Насельніцтва. Карэннае насельніцтва буряты (20,17%). Жывуць рускія (74,6%), украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 2,3 чал. на 1 *км*². Гарадскога насельніцтва 45,0% (1970). Гарады: Улан-Удэ (254 тыс. ж., 1970), Бабушкін, Гусіназерск, Закаменск, Кяхта.

Гістарычны нарыс. Засяленне тэр. Б. пачалося ў верхняга палеаліту. У 3 ст. да н. э.— 11 ст. н. э. тут існавалі недаўгавечныя племянныя саюзы качэўнікаў і аменьвалі адна аду раннефеад. дзяржавы. З пач. 13 ст. Б. пад уладай манголаў, Бур. народнасць склалася ў 17—18 ст. У пач. 17 ст. ў Б. з'явіліся першыя рус. казацкія атрады. У 2-й пал. 17 ст. Б. ўвайшла ў склад Расіі. Гэта мела для Б. прагрэс. значэнне, зрабіла дабратворны ўплыў на ле эканам., паліт. і культ. развіццё. У 2-й пал. 19 ст. у Б. пачалі развівацца капіталіст. адносіны. Умацаванню эканам. сувязей з Расіяй спрыяла буд-ва Сібірскай чыгункі (1892—1905). З гэтага часу царскі ўрад узмацніў прыгнёт буратаў і рэзка абмежаваў іх землекарыстанне, адабраў калі паловы зямель.

Першыя с.-д. групы ў Б. ўзніклі ў 1902—04. Працоўныя Б. ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. Сав. ўлада ўстаноўлена ў лют. 1918. У жн. 1918 тэр. Б. акупавалі японскія інтэрвенты, у крас. 1919 — амер. войскі. У Забайкаллі ўстанавілася ўлада стаўленіка інтэрвентаў атамана Сямёнава. 2.3.1920 Чырв. Армія і прыбайкальскія партызаны вызвалілі Верхнеудзінск (Улан-Удэ), а да канца 1920 усю Буратію. У крас. 1921 у межах Далёкаўсходняй Рэспублікі і ў студз. 1922 у складзе РСФСР утвораны 2 бурацкія аўт. вобласці, якія 30.5.1923 аб'яднаны ў Бурат-Манголыскую АССР (з 7.7.1958 Бур. АССР). За гады Сав. улады Б. стала індустр.-калг. рэспублікай. Створана буйная прамысловасць. У рэспубліцы адбыліся значныя культ. пераўтварэнні, склалася бур. сацыяліст. нацыя. У Вял. Айч. вайну 33 воіны з Б. сталі Героямі Сав. Саюза, больш за 35 тыс. чал. узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Хутка развіваецца прамысловасць у пасляваен. гады. Аб'ём валавой прадукцыі буйной прамысловасці ў 1968 павялічыўся ў параўнанні з 1923 амаль у 5 разоў. Прадукцыя Б. вывозіцца ў 37 замежных краін. У 1950 за поспехі ў гасп. і культ. будаўніцтве і з нагоды 300-годдзя добраахвотнага ўваходжання ў склад Расійскай дзяржавы Б. узнагароджана ордэнам Леніна.

Народная гаспадарка. Асн. галіны прамысловасці — горназдабываючая, маш.-буд., металаапрацоўчая, лясная і дрэваапрацоўчая. У Джыдзінскім р-не здабыча і перапрацоўка вальфраму і малібдэну (камбінат у Закаменску); здабываецца буры вугаль у Гусіназерскім і Балнгольскім радовішчах, золата ў бас. р. Віцім і Баргузінскай тайзе. З-ды: лакаматыва-вагонны, «Электрамашына», «Цеплаприлада», суднабудаўнічы, суднарамонтны, рамонтна-механічны, найбольшы ў Сібіры шклозавод ва Улан-Удэ. З-д дрэваапр. станкоў (Селендума), аўтарамонтны (Ілька). Лесанарыхтоўкі пераважна ў бас. р. Уды і на ўсх. узбярэжжы Байкала. Пільні і Селенгінскі цэлюлозна-кардонны камбінат. Харч. прамысловасць: кансервава-мясны камбінат (Улан-Удэ), масласыраробчы і цукровы з-ды (Бічура). Асн. раён рыбалоўства — воз. Байкал (больш як 40% улову рыбы ва Усх. Сібіры, рыбакансервавы з-д у Усць-Баргузіне). Суконныя і валюшна-лямцавая ф-кі ва Улан-Удэ, абутковая і прадзільна-трыкатажная ў Кяхце, гарбарны з-д у Чыкоі. У Б. 78 калгасаў і 69 саўгасаў (1970). Асн. галіна с. гасп. — жывёлагадоўля мяса-шэрснага і мяса-малочнага кірунку. Развіта танкарунная і паўтанкарунная авечкагадоўля. На пач. 1970 (тыс. галоў) авечак і коз 1706,3, буйн. раг. жывёлы 439,5 (у т. л. кароў 160,5), свіней 152,5, птушак 1481,8. На зверафермах гадуюць сорабрыста-чорных лісоў, норак, усурыйскіх янотаў; на Пн — аленяў. Пасяўная пл. ў 1969 (тыс. *га*) 815, з іх 347,7 пад яравой пшаніцай. Саюзц авёс (105,7 тыс. *га*), ячмень (18,3 тыс. *га*), жыта (10,4 тыс. *га*), грэчку (4,4 тыс. *га*), проса, кукурузу. Пасевы бульбы, агародніны і цукр. буракоў 25,6 тыс. *га*, кармавых культур 291,1 тыс. *га*. Даўж. чыгунак 646 *км* (1969). У паўд. частцы — Сібірская магістраль. На Пд ад яе адыходзіць чыгунка Улан-Удэ — Наушкі. Аўтамаб. дарог больш за 1 тыс. *км*; галоўныя: Улан-Удэ — Кяхта і Тункінскі тракт. Суднаходства на Байкале, Селенгэ.

Геалагічная партыя ў гарах Усх. Саяна.



Ахова здароўя. На пач. 1969 у Бур. АССР 147 бальнічных устаноў на 8856 ложкаў, 11 дыспансераў, 1452 урачы ўсіх спецыяльнасцей, 5663 чал. сярэдняга мед. персаналу. Рэспубліка багатая на мінеральныя крыніцы (Аршан, Гарачынск, Баўнт, Нілава Пустынь). 14 санаторыяў, 10 дамоў адпачынку, 4 прафілакторыі.

Культура. Да Кастр. рэвалюцыі буряты не мелі сваёй пісьменнасці. Навучалася толькі 4% дзяцей. У 1914/15 навуч. г. ў агульнаадук. школах займалася 13,5 тыс. чал. Сярэдніх, спецыяльных і ВНУ не было. За гады Сав. улады непісьменнасць у Б. ліквідавана, ажыццёўлена усеагульнае абавязковае навучанне на роднай мове. У 1967/68 навуч. г. працавалі 634 агульнаадук. школы ўсіх відаў (185,6 тыс. вучняў), 22 сярэднія спец. навуч. установы (19,7 тыс. навучэнцаў), Бур. пед. ін-т, Бур. с.-г. ін-т, Усх.-сібірскі тэхнал. ін-т, Усх.-сібірскі ін-т культуры (усяго ў ВНУ 18,1 тыс. чал.). У рэспубліцы 3 музеі, 464 б-кі, 575 клубных устаноў, 740 кінаўстановак (1968). Тэлецэнтр ва Улан-Удэ. 11 н.-д. устаноў: Бур. філіял Сібірскага аддз. АН СССР, Бур. дзярж. с.-г. доследная станцыя і інш. Ёсць выдавецтва. Рэсп. газеты «Буряад үнэн» («Праўда Буратіі») і «Правда Бурятии».

Асновай бур. л-ры стаў фальклор. Заснавальнік ле — паэт, празаік і драматург Х. *Намсараеў*. Першы бур. аповесці, у якіх паказана класавая барацьба ва улусе, працэс калектывізацыі, напісаў Ц. Дон (Ц. Дандубон): «Месяц у вацьмені», «Атручэнне ад брынзы». Для развіцця бур. паэзіі шмат зрабілі Салбаноў Тул (П. Н. Данбінаў), Д. Дашынімаеў, Б. Баваронг, Б. Абідуеў, Ц. Галсанаў. Актыўна працуюць паэты Л. Бадаеў, Ц.-Б. Бадмаеў, Ц.-Д. Дандукава, Д. Жалсараеў, Ц.-Ж. Жымбіеў, М. Дамдзінаў, Ш. Німбуеў і інш. У пасляваен. гады развіваецца жанр гістар. рамана: «Стоп прачнуўся» Ж. Тумунава, «Гудзе паравоз» Ж. Балданжабона, «Апошняе адступленне» І. Калашнікава, «Ноч памірае на світанні» М. Сцяпанава, «Даржы, сын Ванзара» (1-я ч. трылогіі; 2-я ч.— «Далёка ад родных стэпаў») Ч. Цыдэндамбаева. З раманаў на сучасныя тэмы вылучаюцца: «Хілок наш бурліны» В. Мунгонава і «Блакітныя сопкі» Балданжабона. Папулярныя п'есы Н. Балдано: «Прарыў», «Оржон» (а М. Эдэлем), «Багатая ніва», «Полымя»; Ц. Шагжына: «Будамшу», «Сумленне», «Чорт у куфры»; Д. Батажабал «Барометр паказвае буру» і інш. Вядомы апавяданні, аповесці Д. Батажабая, Ц. Галанава, Ц. Дамдзінжанава, А. Жамбалдаржыева, Ц. Намтоева і інш.

На тэр. Б. зберагліся шматлікія «пісаніцы» розных часоў: наскальныя малюнкі жывёл, людзей, сцэны паляванні і інш.; т. зв. «аленевыя камяні» — вертыкальныя пліты з выявамі аленяў (бронзавы век). Стагоддзямі буряты-жывёлаводы жылі ў разборных лямцавых юртах, пераважна 8- і 6-вугольных. З пашырэннем у Забайкаллі будызму (18 ст.) ствараюцца будыйскія манастыры — «дацаны». Пасля далучэння Б. да Расіі узнікаюць крэпасці-астрогі, гарады. У 18—19 ст. будуюцца мураваныя цэрквы, гасцінныя дворы і інш., з 19 ст. — хаты рус. тыпу. За гады Сав. улады расшырана і добраўпарадкавана сталіца Б. Улан-Удэ; забудоўваюцца новыя гарады — Бабушкін, Закаменск, Гусіназерск. У нар. мастацтве Б. здаўна пашыраны шматколерная ўзорная вышыўка і аплікацыя, разьба і роспіс на дрэве, разьба па косці, арнаментаваныя вырабы з лямцу. Асабліва цікавае мастацкае адзенне вырабаў з металу: насечка, гравіроўка, чаканка, чэрнь. У арнаменце — геам. ўзоры. У сав. час узнікла станковае мастацтва (партрэт, пейзаж, тэматычная карціна). Першы мастак-бурат — Ц. Самплаў, у творах якога ярка адлюстраваны нац. вобразы, рысы побыту жыцця народа. Сярод мастакоў: А. Аклалінскай, Д. Бадмаеў, Г. Важонаў, Д. Дугараў, А. Кавансці, Д. Логінава, Г. Маскалёў, Р. Мердыгееў, П. Пяволіна, Г. Паўлаў, А. Сахароўская, Г. Тубчынаў, А. Цімін, Ю. Чыркоў, М. Шастакова і інш.



Ц. Самплаў. Каханне ў стэпе. 1925.

Бур. народ стварыў песні розных жанраў, інстр. найгрышы. У залежнасці ад выканання песні дзеляцца на 2 віды: ута дуун (працяжныя песні імправіз. складу са складаным рытмам і багатай арнаментыкай) і багоні дуун (кароткія куплетныя песні). У аснове ладавай будовы пентатоніка. Нар. муз. інструменты: сур, лімба (духавыя тыпу флейты), хур (смычковы). У гады Сав. улады склалася прафесійная муз. культура, з'явіліся нац. кампазітары (Б. Ямпілаў, Д. Аюшэеў, Ж. Батуеў і інш.), выканаўцы (сярод іх нар. арт. СССР Л. Лінхавоін). Развіццю нац. музыкі садзейнічалі рус. кампазітары М. Фралоў, П. Берлінскі, С. Раўзаў і інш. Цэнтры муз. культуры — Бур. т-р оперы і балета, муз. вучылішча, Саюз кампазітараў.



Сцэна з оперы «Мадэгмаша» С. М. Раўзава ў Бурацкім оперным тэатры. Улан-Удэ. 1949.

Вытокі бур. тэатра ў нар. песнях, гульнях, абрадах, пантамімічных танцах («цам»). У пач. 20 ст. наладжваліся этнагр. і аматарскія вечары, з'явіліся бур. рукапісныя п'есы. Існаваў аматарскі т-р (1908—17). Пасля Кастр. рэвалюцыі шырока развіваецца тэатр. самадзейнасць, ставяцца агіт. творы. З 1927 ва Улан-Удэ працуе т-р рус. драмы. У 1932 створаны Бур. драм. т-р, у 1938 — калг.-саўг. т-р. У рэпертуары — п'есы Х. Намсараева, Г. Цыдынжанава, Н. Балдано, Д. Батажабая і інш. У бур. т-рах сталіся бел. п'есы «Выбачайце, калі ласка!» (Бур. вандроўны драм. т-р, 1954) і «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка (Бур. т-р драмы імя Намсараева, 1962), «Над адным небам» А. Маўзона (Рус. драм. т-р, 1963). Вядомыя тэатр. дзеячы: нар. арт. СССР Г. Цыдынжанаў, нар. артысты РСФСР Б. Вампілаў, Н. Гендунова, Ч. Генінаў, У. Халматаў, нар. артысты Бур. АССР Н. Балдано, Д. Дандукаў і інш.

Літ.: История Бурятской АССР, т. 1—2, Улан-Удэ, 1954—59 (назва т. 1 — История Бурят-Монгольской АССР); Исследования и материалы по истории Бурятии, «Труды Бурятского ин-та общественных наук БФ СО АН СССР», 1968, в. 5, Сер. историческая; История бурятской советской литературы, Улан-Удэ, 1967; Искусство Бурятской

АССР, Улан-Удэ, 1959; Миерт Л. К. Архитектурное творчество бурятского народа и национальные традиции в архитектуре Советской Бурятии, «Труды Бурятского комплексного НИИ», 1961, в. 6. Сер. историко-филологич.; Тумахани А. В. Бурятское народное искусство, у кн.: Краеведческий сборник, в. 7, Улан-Удэ, 1962 (Бурятский филиал Географич. об-ва СССР); Соктоева И. И. Живопись Советской Бурятии, Улан-Удэ, 1965; Куницына И. и Куницын О. Музыка Советской Бурятии, Улан-Удэ, 1968; Найдакова В. Современный бурятский драматический театр (1949—1962 гг.), Улан-Удэ, 1962.

А. С. Ахінчыц (прырода, гаспадарка). Мінск; *Г. А. Гудэнаў* (літаратура), *Б. В. Алзоеў* (музыка). Улан-Удэ; *Я. В. Баркгаўзен* (архітэктура, выяўленчае мастацтва). Масква.

БУРАЯ ЛАТВІЙСКАЯ парода буйной рагатай жывёлы, парода малочнага кірунку. Выведзена ў Латвіі ў канцы 19 ст. скрыжаваннем мясцовых з ангельскай і чырвонай дацкай пародамі. Масць чырвоная, радзей рыжая і цёмна-чырвоная. Сярэднія прамеры кароў (*см*): выш. ў карку 126, касая даўж. тулава 156, абхват грудзей 184, пяcці 19. Сярэдняя жывая маса кароў 450—500 *кг*, быкоў 800—900 *кг*. Малочная прадукцыйнасць 3000—4000 *кг*, тлустасць малака 3,9—4,1%. Выкарыстоўваецца для паляпшэння інш. парод буйн. раг. жывёлы ў многіх рэспубліках СССР. Гадуюць у Латв. ССР, РСФСР, Удм. АССР. У БССР планавая парода, пашырана пераважна ў Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай абл. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Буйная рагатая жывёла.*

БУРБАКІ Нікала (Bourbaki Nicolas), псеўданім групы французскіх матэматыкаў (склад групы невядомы і з часам мяняецца), якія аб'ядналіся ў 1937, каб напісаць поўны трактат сучаснай матэматыкі. Многія выпускі трактата пад загалоўкам «Элементы матэматыкі» выйшлі ў Францыі і прынеслі Б. сусветную славу. З 1948 штогод выходзяць працы семінара Б. па актуальных праблемах сучаснай матэматыкі.

Тв.: Рус. пер.— Элементы математики, М., 1963—67.

БУРБІС Алесь [Аляксандр Лаўрынавіч; 8(20).10.1885, Вільня — 20.3.1922], беларускі грамадскі дзеяч, адзін з пачынальнікаў беларускага прафесійнага тэатра. Чл. Камуніст. партыі з 1921. Адзін з заснавальнікаў *Беларускай Сацыялістычнай Грамады*. У 1905 узначальваў рэвалюц. к-т у мяст. Майшагала (каля Вільні). У 1906 арыштаваны і да 1909 сядзеў у турме. Пасля вызвалення працаваў у Віленскім т-ве с. гасп., з 1915 у Нар. банку ў Маскве. Супрацоўнічаючы ў газ. «Наша ніва», аддаваў шмат увагі арганізацыі драм. гурткоў і бел. вечарынак. Удзельнічаў у рабоце *Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага*, *Беларускага музычна-драматычнага гуртка* ў Вільні. Выступаў як акцёр і чытальнік бел. вершаў, рэжысёр. Пастаніў спектаклі «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага (1906, хутар Пятроўшчына), «Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча (1915, Вільня). Пасля Кастр. рэв. працаваў у бел. установах у Маскве, Смаленску і інш. У час акупацыі Беларусі немцамі (1918) працаваў у Маскве ў бежанскіх бел. арг-цыях, з люта. 1919 у ВСНГ (Цэнтратук), з 1.5.1919 у Наркамземе Літоўска-Беларускай ССР і БССР, павятовы прадстаўнік БССР у Наркамземе РСФСР. Удзельнічаў у падрыхтоўцы *Рыжскага мірнага дагавору 1921*. З 1.7.1921 нам. наркома замежных спраў БССР. Адзін з арганізатараў і чл. ЦК праўлення Т-ва Чырвонага Крыжа БССР. Чл. ЦВК БССР 3-га скл. (1921—22). Аўтар даследаванняў па эканам. геаграфіі, гісторыі і этнаграфіі Беларусі (пад псеўданімамі А. В., Стары Піліп і інш.).

Тв.: Кароткі агляд беларускага пацыяналрэвалюцыйнага руху, «Вестник Народного комиссариата просвещения», 1921, № 1—2; Краткий очерк по экономической географии Белоруссии, «Народное хозяйство Белоруссии», 1922, № 4.

Літ.: Жылуновіч З. Алесь Бурбіс (Рэвалюцыйная характарыстыка), «Полымя», 1927, № 2. *М. І. Каміскі, С. А. Пятровіч.* Мінск.

БУРБОНЫ (франц. Bourbons, іісп. Borbones, італьян. Borboni), каралеўская дынастыя: у Францыі 1589—1792, 1814—15, 1815—30; у Іспаніі 1700—1808; 1814—68, 1874—1931; у Неапалітанскім каралеўстве 1735—1805, 1814—60; у Парме і П'ячэнца 1748—1802, 1847—59 і ў некат. інш. італьянскіх дзяржавах. У Францыі бурж. рэв. канца 18 ст. скінула Б., але ў 1814 і пасля «ста дзён» яны зноў прыйшлі да ўлады. Дынастыя Б. у Іспаніі пачалася з Філіпа V — унука Людовіка XIV. Скінута ў выніку рэвалюц. падзей і ўсталявання ў краіне (1931) бурж. рэспублікі. Сыны Філіпа V заснавалі неапалітанскую і пармскую галіны Б. Страцілі ўладу ў перыяд аб'яднання Італіі 1859—60.

БУРГАМІСТР (ням. Bürgermeister), 1) выбарная асоба, якая ўзначальвала мясцовае самакіраванне ў сярэдневяковых гарадах, дзе дзейнічала *магдэбургскае права*. 2) У час Айч. вайны на акупаванай тэр. (у т. л. БССР) ням. фашысты над выглядам мясцовага самакіравання назначалі ў гарадах і вёсках Б. з дэкласаваных элементаў і здраднікаў Радзімы (гл. *Акупацыйны рэжым*). 3) У ГДР Б. ўзначальваюць органы самакіравання невялікіх гарадоў і нас. пунктаў.

БУРДЗЕЙКА Андрэй Вікенцьевіч [8(20).6.1899, Мінск — 1941], беларускі савецкі гісторык. З сялян. Скончыў БДУ (1925). Даследаваў пераважна зямельнае права і прававое становішча сялянства ў феад. эпоху. На аснове аналізу Статута 1566 дакаваў існаванне прыгонніцтва ў Вял. кн. Літоўскім. Аўтар прац па сац.-эканам. гісторыі Беларусі: «Нарыс сацыяльна-эканамічнага жыцця места Навагрудка ў XVI ст.», «Да пытання аб рэформе 1861 г.»; крыніцазнаўстве: «Прыказ Вялікага княства Літоўскага (фонд установы і функцыі)».

Тв.: Землеўласнік і земляроб па Літоўскаму статуту 1566 г., «Працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску», 1927, № 14—15, 1928, № 20; Беларускі дзяржаўны культурна-гістарычны музей у Мінску. Гістарычны аддзел. Праваднік-ліставоўка, Мн., 1930. *З. Ю. Капыскі.* Мінск.

БУРДЗЕЙНЫ Аляксей Сямёнавіч [п. 5(18).10.1908, Жытомір], савецкі ваенны дзеяч, Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1928. У Чырв. Арміі з 1931. 2-і Тацінскі танкавы корпус, якім камандаваў Б., уведзены ў наступленне каля в. Клюкаўка на Пд ад Багушэўска Віцебскай вобл. 26.6.1944, перарэзаў чыг. і шашу Масква — Мінск, удзельнічаў у вызваленні Оршы і, імкліва наступаючы, 3.7.1944 на досвітку першы ўварваўся ў Мінск. З 1950 да 1963 у Бел. ваен. акрузе: памочнік, намеснік і першы нам. камандуючага войск акругі. Ген.-палкоўнік Б. — ганаровы грамадзянін Мінска. Жыве ў Маскве.



БУРДЗЮК (цюрк.), мяшок з суцэльнай скуры буйвала, каня ці барана, у якім трымаюць і перавозяць віно, кумыс, ваду і інш. Пашыраны ў краінах Усходу.

БУРДЭЛЬ (Bourdelle) Эміль Антуан (30.10.1861, Мантабан — 1.10.1929), французскі скульптар. Вучыўся ў Тулузе, Парыжы. Працаваў у А. Радэна (з 1889). Творчасці Б., прадстаўніка прагрэс. мастацтва 20 ст., уласцівыя пошукі новых сродкаў для выяўлення гераічных і драматычных ідэй у манумент. скульптуры (помнікі: шахцёрам, што загінулі на вайне, 1919—24, Мансо-ле-Мін; А. Міцкевічу, 1909—29, Парыж; К. Альвеару, 1914—23, Буэнас-Айрэс). Творы вызначаюцца моцнымі дынамічнымі формамі («Геракл-стралок», 1909), эмацыянальнай і псіхалагічнай сілай, завостранасцю характарыстык (партрэты Л. Бетховена, А. Радэна, Д. Энгра, А. Франса). На творчасці Б. далі сябе знаць захапленне мастацтвам мінулага (антычнай архаікі, Рэнесансу, франц. готыкі) і ўплыў майстроў П. Пюжэ, Ф. Руда, А. Л. Бары.

БУРДЭНКА Мікалай Нілавіч [26.4(8.5).1876, в. Каменка Ніжне-Ломаўскага пав. Пензенскай губ. — 11.11.1946], савецкі вучоны ў галіне хірургіі. Акад. АН СССР (1939), правадз. чл. АМН СССР (1944), ген.-палк. мед. службы. Чл. КПСС з 1939. У 1906 скончыў мед. ф-т Юр'еўскага ун-та. З 1910 праф. гэтага ун-та, з 1923 — Маскоўскага. У 1934 заснаваў у Маскве нейрахірургічны ін-т і быў дырэктарам яго да канца жыцця. У 1944—46 прэзідэнт АМН СССР. Асн. працы па ваенна-палявой хірургіі і нейрахірургіі, па пухлінах і траўматычных пашкоджаннях цэнтр. і перыферычнай нервовай сістэмы, парушэннях мазгавога кровазвароту; распрацаваў шэраг нейрахірургічных аперацый. Заснаваў эксперым.-фізіялагічную школу ў нейрахірургіі. Быў старшынёй праўлення т-ва хірургаў (з 1932), гал. хірургам-кансультантам Чырв. Арміі (з 1937). Дэлегат Надзвычайнага VIII з'езду Саветаў. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га і 2-га скл. Ганаровы чл. Міжнар. хірург. т-ваў. Герой Сац. Працы (1943). Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—7, М., 1950—52.

Літ.: Багдасарьян С. М. Николай Нилович Бурденко, М., 1954.

«БУРЕВЕСТНИК», штодзённая газета Паўн.-Зах. абласнога бюро РСДРП(б), якая выдавалася ў Мінску 8—29.10(21.10—11.11). 1917 замест закрытай Часовым урадам газ. «Молот» (абедзве — часовыя назвы бальшавіцкай газ. «Звезда»). Арганізавана М. В. Фрунзе. Выйшла 19 нумароў. У «Б.» надрукаваны арт. У. І. Леніна «Крызіс наспеў», «Пісьмо да таварышаў», раздзелы з работы «Пагражаючая катастрофа і як з ёй змагацца», змешчаны «Дэкларацыя фракцыі бальшавікоў аб выхадзе з Прадпарламента» і інш. дакументы ЦК РСДРП(б). З 1(14).11. 1917 выходзіць пад ранейшай назвай «Звезда» (гл. *«Звязда»*).

БУРЖУАЗІЯ (франц. bourgeoisie), пануючы клас капіталіст. грамадства, які ўладае ўсімі галоўнымі сродкамі грамадскай вытворчасці, прысвойвае сукупны грамадскі прадукт, ажыццяўляе ўсю паўнату эканам. і паліт. улады.

Б. ўзнікла і пачала развівацца ў канцы 13 — пач. 14 ст. на аснове саслоўя рамеснікаў і гараджан. Гэтаму перыяду ўласцівы працэс першапачатковага накаплення капіталу ў выніку імклівага развіцця прамысловасці, гандлю, мараплаўства, экспрапрыяцыі зямель у сялянства, які адбываўся ў межах феад. гр-ва і прывёў да развіцця новых прадукцыйных сіл. Спачатку Б. выступала як клас, які кіраваў прагрэс. рухам нар. мас супраць феадалізму. Яна абвясціла лозунгі свабоды, роўнасці і братэрства, аднак адмовілася ад іх, калі захапіла ўладу. У большасці краін Зах. Еўропы і ЗША захоп улады Б. адбыўся ў 16 — 1-й пал. 19 ст. ў выніку бурж. рэвалюцый (гл. *Буржуазная рэвалюцыя*). У шэрагу інш. краін (Аўстрыя, Венгрыя, Японія) Б. прыйшла да ўлады ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Капіталіст. ладу ўласціва дыктатура Б.; эканам. аснова яе класавага панавання — капіталіст. ўласнасць. Яна дае магчымасць прысвойваць прыбавачную вартасць дзякуючы эксплуатацыі наёмнай рабочай сілы. Першапачатковай формай арг-цыі новых прадукцыйных сіл з'яўлялася *мануфактура*, на змену якой прыходзіць буйная машынная прамысловасць. Развіццё капіталіст. вытворчасці адбываецца і ў с. гасп., дзе памешчыкі ператвараюцца ў капіталіст. прадпрыемцаў, а сяляне — у с.-г. пралетарыят. Разам з фарміраваннем Б. як класа ў гр-ве ўтвараюцца небывалыя полюсы багацця і галечы. У эпоху імперыялізму ўзмацняецца эксплуатацыя, расце беспрацоўе. Гэта садзейнічае паглыбленню антаган. супярэчнасцей паміж Б. і працоўнымі. Супярэчнасці існуюць і ўнутры самой Б. Прычына — імкненне капіталістаў і іх аб'яднанняў павялічыць сваю долю ў падзеле прыбавачнай вартасці. Формы класавага аб'яднання Б. — саюзы і асацыяцыі прамыслоўцаў і банкіраў. Гэта цэнтралізаваная сістэма, якая ахоплівае ўсе слаі Б. Пануючую ролю ў такіх аб'яднаннях адыгрывае дзярж.-манапаліст. капітал. Б. стварае свае паліт. партыі, якія адстойваюць не паліт. інтарэсы і маюць на мэце згуртаваць вакол Б. ўсе сац. класы і групы. Такіх партый шмат, кожная адлюстроўвае інтарэсы пэўных груп Б.

Гістар. заслуга Б. ў тым, што яна знішчыла феадалізм, паскорыла развіццё прадукцыйных сіл. Аднак гэта стварыла аб'ектыўную аснову для знішчэння яе самой: капіталіст. вытв. адносіны сталі тормазам развіцця прадукцыйных сіл. Разам з капіталізмам расце не толькі Б., але і яе антаганіст — пра-

летарыят, які ў канцы 19 і ў 20 ст. выступіў як клас, што ўсведамляе свае класавыя ідэалы і абавязкі. Як адзначаў У. І. Ленін, з пераходам капіталізму ў сваю апошнюю стадыю — *імперыялізм* — Б. вычарпала сваю ролю прагрэс. класа. Гэты ўпадак суправаджаецца рэзкім абвастрэннем усіх гал. супярэчнасцей капіталізму, узмацненнем класавых антаганізмаў у перыяд *агульнага крызісу капіталізму*. На гэтым этапе Б. становіцца самым рэакц. і паразітычным класам у гісторыі, перашкаджае замене капіталіст. вытв. адносін больш прагрэсіўнымі — сацыялістычнымі. Б. перадае кіраванне вытв. працэсамі высокааплатным чыноўнікам — бюракратыі, а сама ператвараецца ператворна ў спажыўца грамадскіх даброт. Грамадскія супярэчнасці яна вырашае шляхам мілітарызацыі эканомікі, правядзення агрэс. знешняй палітыкі, задушэння рэвалюц. рабочага руху, знішчэння бурж.-дэмакр. свабод. У той жа час Б. спрабуе прыстасавацца да ўмоў барацьбы дзвюх сістэм, да навукова-тэхн. рэвалюцыі, ужываючы розныя формы непасрэднага і ўскоснага дзярж. рэгулявання эканам. развіцця і інш. Каб утрымаць уладу, заключае саюзы з самымі рэакц. сіламі, нават з фашызмам. «Аджываючая буржуазія, — пісаў У. І. Ленін, — яднаецца з усімі аджыўшымі і аджываючымі сіламі, каб захаваць хісткае наёмнае рабства» (Тв., т. 19, с. 77). У гэтых умовах усе дэмакр. сілы аб'ядноўваюцца ў саюз супраць Б., і барацьба за дэмакратыю з'яўляецца састаўной часткай барацьбы за сацыялізм. Б. выступае як галоўны вораг нац.-вызв. руху ў каланіяльных і залежных краінах. Але розныя яе слаі адыгрываюць неаднолькавую ролю. Кампрадорская Б., якая звязана з замежным капіталам, памешчыкамі і феадаламі, паслухмяна выконвае волю міжнар. імперыялізму. Нац. Б. звычайна сама прыгнятаецца замежным і кампрадорскім капіталам. Таму большасць яе прадстаўнікоў займае антыімперыялістычныя пазіцыю і ў гэтым выпадку аб'ядноўваецца з пралетарыятам і сялянствам. Аднак пасля перамогі нац.-вызв. барацьбы яна імкнецца захапіць камандныя пазіцыі ў эканоміцы і палітыцы і звычайна сама становіцца рэакц. сілай. У выніку сацыялістычныя рэвалюцыі пралетарыят бярэ ўладу ў свае рукі. Пераход ад капіталізму да камунізма аб'ектыўна непазбежны. Б. не аддае ўлады добраахвотна, і таму рэвалюц. масы, якімі кіруюць пралетарыят і яго партыя, пры неабходнасці вымушаны ўжываць насілле. Так было ў час Кастр. рэвалюцыі ў Расіі, сацыялістычныя рэвалюцыі ў інш. краінах. Аднак пралетарыят гатовы супрацоўнічаць з коламі Б., лаяльнымі да новага ладу, згоднымі ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве. Б. — апошні сац. клас, панаванне якога заснавана на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, яе гібель абумоўлена ўсім ходам грамадскага прагрэсу.

Літ.: Маркс К. і Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Маркс К. Капітал, т. 1—4, Мн., 1952—68; яго ж. Классовая борьба во Франции с 1848 по 1850 г., Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 7; Энгельс Ф. Революция и контрреволюция в Германии, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 8; Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Полн. собр. соч., т. 3); яго ж. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 33); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Дакументы Міжнароднай нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрвеня 1969, Мн., 1969. *І. І. Антановіч.* Мінск.

БУРЖУАЗНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ, тып сацыяльнай рэвалюцыі, якая накіравана на ліквідацыю феадалізму і ўсталяванне паліт. улады буржуазіі. Эканам. асновай Б. р. з'яўляецца канфлікт паміж феад. вытв. адносінамі і ўзніклымі капіталіст. прадукцыйнымі сіламі. У эпоху Б. р. адбываецца заканамерны працэс замены ўстарэлай феад. фармацыі новай — капіталістычнай. Б. р. перадае паліт. ўладу з рук адной эксплуататарскай групы — феадалаў — у рукі другой эксплуататарскай групы — капіталістаў. Асаблівасць Б. р. ў тым, што яна адбываецца пры наяўнасці больш ці менш гатовых формаў капіталіст. ўкладу, які вырастае ў нетрах феадалізму. У сувязі з гэтым у Б. р. ўдзельнічае не толькі сялянства — асн. прыгнечаны клас пры феадалізме, але і буржуазія і пралетарыят, звязаныя з новым, больш прагрэс. спосабам вытворчасці. Хоць кожны з гэтых класаў імкнецца да сваёй мэты, усіх іх яднаюць агульныя інтарэсы барацьбы супраць феад. ладу.

Працэс ліквідацыі феадалізму пачаўся яшчэ ў 16 ст., але ў асобных краінах свету ён не закончыўся і да гэтага часу. У залежнасці ад гістар. эпохі вызначаюцца характар Б. р., расстаноўка класавых сіл і кіруючы ёю клас. Першыя пераможныя бурж.-антыфеад. рэвалюцыі — нідэрландская (1566—1609), англійская (1640—60), французская (1789—94) — адбыліся ва ўмовах прагрэс. развіцця капіталізму пры актыўным удзеле працоўных горада і вёскі, пры гегемоніі буржуазіі. Яны прынеслі перамогу бурж. уласнасці над феадальнай, канкурэнцыі над цэхавым ладам, бурж. права над сярэдневяковымі прывілеямі. У той час бурж. ідэолагі выдавалі свае інтарэсы за інтарэсы ўсяго народа, а буржуазія мусіла ісці на саюз з шырокімі нар. масамі. Дасягнуўшы ўлады, яна лічыла рэвалюцыю закончанай і ўступала ў саюз з дваранствам і манархіяй. З усіх Б. р. найб. паспяховы тып, у якіх удзельнічалі шырокія колы працоўных. Найб. радыкальнай у гэтым сэнсе была франц. рэвалюцыя 1848. У залежнасці ад складу рухаючых сіл рэвалюцыі, ад большага ці меншага ўдзелу ў іх нар. мас, ад іх актыўнасці Б. р. падзяляюцца на «вярхоўныя» і народныя. Да ліку першых належаць такія Б. р., у якіх амаль не ўдзельнічаюць масы і якія не закранаюць сац.-эканам. адносін, у прыватнасці аграрных. Прыкладам такіх рэвалюцый могуць быць турэцкая (1908) і партугальская (1910).

Асобная форма бурж. рэвалюцыі — народная, або бурж.-дэмакр. рэвалюцыя. Яна вызначаецца актыўным удзелам шырокіх нар. мас, якія выступаюць са сваімі асабістымі патрабаваннямі, імкнуцца па-свойму перабудаваць грамадства, уплываюць на ўвесь ход рэвалюцыі. Прыкладам бурж.-дэмакр. рэвалюцый у эпоху імперыялізму з'яўляюцца рускія рэвалюцыі 1905 і 1917 (люты). Гегемонам бурж.-дэмакр. рэвалюцыі выступае пралетарыят, якім кіруе марксісцка-ленінская партыя, а манапал. буржуазія займае контррэвалюц. пазіцыю ў адносінах да рэвалюц. барацьбы пралетарыяту і дэмакр. сялянства. Пераможная бурж.-дэмакр. рэвалюцыя над кіраўніцтвам пралетарыяту можа прывесці да ўсталявання дэмакр. дыктатуры пралетарыяту і сялянства і пры спрыяльных умовах перарастае ў сацыяліст. рэвалюцыю. У эпоху ўсеагульнага крызісу імперыялізму карэнным чынам зменьваецца расстаноўка класавых сіл у краінах, у якіх яшчэ не вырашаны задачы антыфеад. рэвалюцыі. У гэтых краінах бурж.-дэмакр. рэвалюцыя часта зліваецца з нац.-вызв. барацьбой супраць імперыялізму. У некат. краінах Афрыкі і Азіі адбыліся Б. р., накіраваныя не толькі супраць феад. перажыткаў, але і супраць чужаземнага прыгнёту, за нац. незалежнасць. Па сваёй сутнасці яны антыімперыялістычныя. У выніку паспяховага завяршэння гэтых рэвалюцый ствараюцца незалежныя дзяржавы нац. дэмакратыі, якія атрымліваюць магчымасць развівацца па некапіталіст. шляху.

Літ.: Маркс К. Классовая борьба во Франции с 1848 по 1850 г., Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 7; яго ж. Буржуазия и контрреволюция, там жа, т. 6; Ленін У. І. Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі, Тв., т. 9 (Полн. собр. соч., т. 11); яго ж. Аб задачах пралетарыята ў данай рэвалюцыі, Тв., т. 24 (Полн. собр. соч., т. 31); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 33); яго ж. Пралетарская рэвалюцыя і рэнегат Каўцкі, Тв., т. 28 (Полн. собр. соч., т. 37); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961, ч. 1, разд. 5, 6. *П. Ф. Прагасеня.* Мінск.

БУРКА, 1) лямцавы безрукаўны плашч-накідка ў каўказскіх горцаў. У коннікаў доўгі са швамі, варсісты з шырокімі выступамі ў плячах; у пастухоў кароткі, гладкі, без швоў. На Украіне і ПдУ Беларусі Б. называюць доўгі плашч з дыматканага сукна з рукавамі і башлыком. Надзявалі яго ў непагадзь паверх кажуха. 2) Старадаўняе беларускае адзенне, спадніца з дыматканай шарсцяной або паўшарсцяной тканіны. Афарбоўка: папярочныя ўзорныя палосы, арнамент якіх складаецца з геам. фігур чырвонага, чорнага, зялёнага, сіняга колераў. Была найб. пашырана на ПдЗ Беларусі.

БУРКІ, вёска ў Астраглядскім с/с Брагінскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоная ніва». За 7 *км* на З ад Брагіна, 135 *км* ад Гомеля, 24 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 798 ж., двароў 221 (1970). Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

БУРКОВІЧ Веніямін Антонавіч (н. 29.7.1937, пас. Усць-Коін Усць-Вымскага р-на Комі АССР), беларускі савецкі цымбаліст. Засл. арт. БССР (1967). У 1962 скончыў Бел. кансерваторыю па класе І. Жыновіча. У 1952—57 артыст, з 1957 саліст і з 1960 канцэртмайстар Дзярж. нар. аркестра БССР. Лаўрэат конкурсаў Усесаюзнага і VI Сусв. фестываляў моладзі (1957). Шмат гастраліруе па Сав. Саюзе і за мяжой. Б.-выканаўцу ўласцівы вялікі тэмперамент, віртуозная тэхніка. У рэпертуары творы кампазітараў-класікаў і бел. кампазітараў.

БУРЛАКІ, 1) рабочыя, якія цягалі на рэках судны. У Расіі з'явіліся ў 16—17 ст. у сувязі



Бурлакі на Волзе. Карціна І. Я. Рэпіна.

з павелічэннем перавозак у час фарміравання ўсерасійскага рынку. Бурлацтва было найб. пашырана ў раёнах: Беламорскім — ад Архангельска да Масквы, Волжскім — ад Астрахані да Масквы і Дняпроўскім. Асн. маса Б. — сяляне, што ішлі ў заработкі. Карыстаючыся бяспраўным становішчам Б., суднаўладальнікі бязлітасна іх эксплуатавалі. З развіццём параходства ў 2-й пал. 19 ст. бурлацтва знікла. 2) Бяздомныя халастыя або ўдовыя, бяздзетныя людзі, якія жылі і вялі гаспадарку адасоблена.

БУРМІСТАРСКАЯ ПАЛАТА, цэнтральная адм.-фінансавая і судовая ўстанова ў Расіі ў 17—18 ст. На Беларусі Б. п. існавалі ў гарадах, якія карысталіся *магдэбургскім правам*. Ажыццяўляла нагляд за пасадскімі органамі і зборам гар. павіннасцей. З 1699 называлася ратушай. Пасля стварэння губерняў Б. п. як цэнтральная адм.-судовая ўстанова перастала існаваць (1711).

БУРНАШОЎ Аляксандр Афінагенавіч [н. 4 (17).12.1914, г. Зыранаўск Усць-Каменагорскага пав. Сяміпалацінскай вобл.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1946. Вызначыўся 29.6.1944 калі в. Шчаткава на Пн ад Бабруйска. У час варожай контратакі разлік гарматы, якім камандаваў Б., выбыў са строю, Б. адзін вёў агонь па ворагу, падбіў 4 самаходныя гарматы, 7 бронетранспарцёраў, 5 аўтамашын з боепрыпасамі. Жыве ў Самаркандзе.




БУРНОС, традыцыйнае на Беларусі верхняе мужчынскае адзенне. Б. шылі з дыматканага шэрага, чорнага, карычневага сукна. Пакрой прамы, двухбортны, спінка з хлясцікам. Ужываўся і як плашч, тады шыўся больш доўгі і да каўняра прышываўся або прышпільваўся башлык. Быў найб. пашыраны ў Брэсцкай, Гродзенскай абл. і ў зах. р-нах Мінскай вобл.

БУРСЕВІЧ Максім Тарасавіч (1890, в. Чамяры Слонімскага пав. Гродзенскай губ. — 2.8.1941), удзельнік нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. З сялян. З часу захопу Зах. Беларусі бурж. Польшчай працаваў настаўнікам бел. пач. школы, удзельнічаў у бел. нац.-вызв. руху. У чэрв. 1925 увайшоў у першы

актыў *Беларускага пасольскага клуба* ў польскім сейме. 1.7.1926 кааптаваны ў склад ЦК *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ) і выбраны яго сакратаром. Ствараў мясцовыя к-ты БСРГ і наладжваў іх работу. У лют. 1927 у час разгрому БСРГ арыштаваны і пасаджаны ў турму. На судовым працэсе 56-і кіраўнікоў і актывістаў БСРГ (1928) прыгавораны да 8 гадоў турэмнага зняволення. У 1931 паводле пагаднення паміж урадамі СССР і Польшчы пераехаў у Мінск.

Літ.: Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967.

БУР-СЛУПАСТАЎ, навясное прыстасаванне, прызначанае для бурэння ямаў і ўстаноўкі слупоў. Манціруецца на раме задняй часткі трактара «Беларусь» (гл. рыс.).



Асн. часткі: бур дыяметрам 500 *мм* і кран грузападымальнасцю 0,7 *т*. Для ўстойлівасці трактара пры бурэнні і падыманні слупоў рама мае апоры, якія апускаюцца і падымаюцца гідраўлічным прыводам. Бур круціцца прыводам ад вала адбору магутнасці трактара са скорасцю 109 *аб/мін*. Глыбіня бурэння ямы 1,7 *м*. Час бурэння 1 *пог. м* 1—2,5 *мін*. Падымаюць слупы круком і перакінутым цераз блок на страле канатам, які намотваецца на барабан мех. лябёдкі. Макс. вышыня слупоў, што ставяцца Б.-с., 11 *м*. Буры-слупаставы выпускае мінскі з-д «Ударнік».

БУРСТЫН Цэлясцін Лявонавіч [28.1.1888, г. Тарнопаль (Галіцыя) — 21.10.1938], савецкі матэматык. Акад. АН БССР (1931), праф. БДУ. Скончыў Венскі ун-т (1911), атрымаў ступень д-ра філасофіі (1912). Працаваў у Аўстрыі. Быў чл. КП Аўстрыі (з 1925). У 1929 па запрашэнні БДУ прыехаў у Мінск, узначальваў кафедру матэматыкі ун-та. З 1931 дырэктар Фіз.-тэхн. ін-та АН БССР. Асн. навук. працы па дыферэнцыяльнай геаметрыі, рыманавай геаметрыі, дыферэнцыяльных ураўненнях (агрэгаты Пфафа) і па некат. пытаннях алгебры (тэорыя дыстрыбутыўных груп і інш.). Напісаў на бел. мове навуч. дапаможнік па дыферэнцыяльнай геаметрыі.



Тв.: Математическия працы, Мн., 1932; Курс дыферэнцыяльнай геаметрыі, Мн., 1933; Фізічныя метады матэматыкі, Мн., 1933.

Літ.: Математика в СССР за 40 лет, под ред. А. Г. Куроша и др., т. 2, М., 1959, с. 104 (библиогр.).

І. А. Ратнер. Мінск.


БУРУНДЗІ (Burundi), Рэспубліка Бурундзі, дзяржава ў Экватарыяльнай Афрыцы на паўн.-ўсх. беразе воз. Танганьіка. Пл. 27,8 тыс. км². Нас. 3,4 млн. чал. (1968). Сталіца Бужумбура. Краіна падзяляецца на 8 акруг. Б. — рэспубліка. На чале дзяржавы




і ўрада прэзідэнт. Вышэйшы заканадаўчы орган — Нац. сход. Выканаўчая ўлада належыць ураду.

Прырода. На большай частцы Б. пласкагор'е сярэд. вышыні 1400—1500 *м* на У і 2000—2500 *м* на З. На З горы выш. да 2670 *м*. Уздоўж узбярэжжа воз. Танганьіка і р. Рузізі плоскія алювіяльныя раўніны. Карысныя выкапні: у невял. колькасці волава, вальфрам, берылій, касітэрыт, літыевая руда, нафта. Клімат экватарыяльна-мусонны, у паніжаных раёнах гарачы, на пласкагор'і ўмерана цёплы. Сярэднегадавыя т-ры 16—25 °С. Ападкаў 1000—1300 *мм*, на захадзе 1400—1500 *мм* за год. Шмат парожыстых і несудаходных рэк, якія на Пн і У (Рувуву, Аканью-ру) адносяцца да бас. Ніла, на З і Пд (Малагарасі, Рузізі) — да бас. Конга. Глебы горныя чырвоныя, у даліне Рузізі чорныя трапічныя. Пераважаюць паўторныя саваны, якія ўзнікі на месцы знішчаных мяшаных лістападнавечназялёных лясоў. Пад лесам 69 тыс. *га*. Багаты ў мінулым жывёльны свет Б. амаль вынішчаны. Зебры, антылопы, жырафы, леапарды, гіпапатамы і кракадзілы жывуць у запаведніках. У лясах малпы. Шмат птушак.

Насельніцтва. Асн. народнасць барундзі, належыць да паўн. групы банту. З іх 84%





Бужумбура. Вуліца Патрыса Лумумбы.

бахуту (сялянe), 15 батутсі (знаць), калля 1% пігмеі батва. Жывуць еўрапейцы (пераважна бельгійцы), індыйцы, арабы. Нац. мова кірундзі, афіцыйная — французская. Рэлігія — сінтэз культаў продкаў і прыроды, хрысціянства і ісламу. Сярэдняя шчыльн. нас. 118 чал. на 1 км². Гарады Бужумбура і Гітэга.

Гістарычны нарыс. Стараж. і сярэдневяковая гісторыя Б. мала вывучана з-за адсутнасці пісьмовых крыніц. Пры археал. раскопках знойдзены прылады працы эпохі неаліту. Паводле паданняў феад. дзяржава на тэр. Б. ўзнікла ў 15—16 ст. Росквіт яе прыпадае на 1-ю пал. 19 ст. Б. — адна з нямногіх краін Афрыкі, у якой не было рабства. Пранікненне еўрапейцаў пачалося ў канцы 19 ст. У 1903 кароль прызнаў уладу герм. губернатара. У 1912 нямец. ваен. ўлады канчаткова падначалілі Б. Разам з Руандай яна была ўключана ў склад Герм. Усх. Афрыкі. Незалежныя раней краіны аб'яднаны ў адну — Руанда-Урундзі (на мове суахілі Б. наз. Урундзі). У час 1-й сусв. вайны Б. акупавала Бельгія (1916); у 1923 атрымала ад Лігі Нацый мандат на кіраванне ёю. У 1946 ААН устанавіла над Б. бельг. апеку. З 1959 пачаўся ўздым нац.-вызв. руху. Узніклі першыя палітпартыі. УПРОНА (Партыя адзінства і нац. прагрэсу) абвясціла ў сваёй праграме барацьбу за незалежнасць краіны і ліквідацыю феадалізму; ХДП (Хрысціянска-дэмакратычная партыя) патрабавала пашырэння ўнутр. аўтаноміі ў рамках бельг. апекі. На выбарах у Заканадаўчы сход 18.9.1961, праведзеных пад наглядам ААН, УПРОНА атрымала перамогу і сфарміравала першы ўрад. Спец. сесія ААН 27.6.1961 ліквідавала бельг. апеку. 1.7.1962 Б. абвешчана незалежнай. 16.10.1962 зацверджана першая ў гісторыі краіны канстытуцыя. Дыпламат. адносіны з СССР Б. ўстанавіла 1.10.1962. З 18.9.1962 чл. ААН. Пасля абвяшчэння незалежнасці ў Б. аставаўся манарх. лад. У краіне панаваў эканам. крызіс, палітычная нестабільнасць. Змовы супраць урада Б. падтрымліваліся ЦРУ ЗША, сіламі неакаланіялізму. Кіраўнік урада М. Мічомбера ўзначаліў 28.11.1966 ваен. пераварот, у выніку якога была скінута манархія і Б. абвешчана рэспублікай. Да ўлады прыйшлі дэмакр. сілы на чале з УПРОНА, якая абвясціла пра свой намер весці краіну некапіталіст. шляхам развіцця.

Гаспадарка. Б. — слаба развітая аграрная краіна з перажыткамі родавых і феад. адносін у с. гасп., дзе занята 95% насельніцтва. У эканоміцы пераважае бельг. і амер. капітал. Апрацоўваецца 1420 тыс. *га* зямлі. Характэрна дробнаўласніцкая гасп. з сярэднім памерам зямельнага надзелу каля 1 *га*. Гал. культуры: кава (42 млн. дрэў), бавоўна, чай. Пад бавоўнікам каля 40 тыс. *га*. Пасевы рысу і бавоўніку ў даліне Рузізі, кавы на Пн; на ўзбярэжжы Танганьікі культывуецца маслінавая пальма. Вырошчваюць тытунь, сорга, кукурузу, пшаніцу, батат, маніёк, ямс, бананы. У 1967 сабрана 19 тыс. *т* кавы і 7 тыс. *т* бавоўны. Жывёлагадоўля развіта пераважна ў паўн. узвышаных раёнах. У 1965 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 521, коз 418, авечак 147, свіней 7,8. На воз. Танганьіка рыбалоўства (16,4 тыс. *т* рыбы, 1966). У Бужумбуры ЦЭС магутнасцю 5,1 тыс. *кВт*; 2 невялікія ГЭС каля Бужумбуры і Нгозі. Часткова эл. энергія паступае з Дэмакр. Рэсп. Конга. 6 з-даў па ачыстцы кавы, 2 бавоўнаачышчальныя, тэкст. ф-ка ў Бужумбуры, піваварны з-д і інш. Металарамонтны і цэментны з-ды, коўдравая і сеткавязальная ф-кі. Суднаходства па воз. Танганьіка. Гал. азёрны порт Бужумбура (знешні гандаль). Аэрапорты ў Бужумбуры і Гітэга. Б. вывозіць каву, бавоўну, скуры. Увозіць тэкстыль, абутак, адзенне, харч. тавары, абсталяванне, эл.-тэхн. тавары. Грашовая адзінка — бурундзійскі франк.

Культура. Пач. школа 6-гадовая, прымае дзяцей з 6 гадоў. Навучанне ў малодшых класах на мове кірундзі, у старэйшых класах пач. школы — на франц. мове. У 1965/66 навуч. г. ў пач. школах займалася 145,2 тыс. вучняў. Сярэдняя школа (на базе пач. школы і аднагадовага падрыхтоўчага класа) 6-гадовая, мае 2 цыклы па 3 гады кожны; класічнае і рэальнае аддзяленні. У 1965/66 навуч. г. ў сярэдніх школах займалася 2469 вучняў. Прафесійна-тэхн. школы (на базе пач.) 2—4-гадовыя. У 1960 у Бужумбуры створаны універсітэцкі цэнтр (у 1964 ператвораны ва ун-т); у 1965 васн. вышэйшая пед. школа. У Бужумбуры агранамічны н.-д. ін-т, мед. навук. лабараторыя. Нац. музей і публічная б-ка. Выходзіць штотыднёвая газ. «Unité et Révolution» («Адзінства і рэвалюцыя»).

Найб. развітая галіна маст. рамяства — пляценне з саломы. Цыноўкі, розныя велічыні і формы кашы, посуд аздабляюцца кап'ёнадобным ці зігзагападобным узорам белага, чорнага і чырвонага колеру. Тым жа ўзорам (размаляваным, выпаленым ці нанесеным фарбай) упрыгожваюць вырабы з дрэва: посуд, шчыты, калчаны і інш.

Літ.: Карпушина В. Я. Бурунди, М., 1965.
І. Я. Афнагель (прырода, гаспадарка); *Г. А. Чарнушчанка* (гістарычны нарыс). Мінск.

БУРУНДУК (Eutamias sibiricus), грызун роду бурундукоў сям. вавёркавых. Даўж. цела 10—17 *см*, хваста — 12 *см*. Уздоўж спіны



на жоўтым фоне 5 чорных палосак. Пашыраны Б. пераважна ў хвойных лясах ПнУ Еўропы і Азіі. У БССР не водзіцца. Трымаецца ўзлескаў і зараснікаў па далінах рэк. Корміцца насеннем дрэў, травяністых раслін, ягадамі, грыбамі, насякомымі. Зімой у спячцы. Носьбіт віруса клешчавога энцэфаліту. Прамысл. жывёліна.

БУРХАНАЎ Шукур (н. 5.12.1910, Ташкент), узбекскі савецкі акцёр. Нар. арт. СССР (1959). Чл. КПСС з 1945. З 1927 у тэатры імя Хамзы (Ташкент). Выконваў ролі сучаснікаў у першых узб. сав. п'есах. Этапнай стала роля Гафура («Бай і батрак» К. Яшэна). Акцёр спалучае моцны тэмперамент з глыбінёй думкі, ідэйнай насычанасцю ў ролях класічнага рэпертуару: Гамлет, Брут («Гамлет», «Юлій Цэзар» У. Шэкспіра), Вайніцкі («Дзядзька

Ваня» А. Чэхава). З 1940 вдымаецца ў кіно («Зорка Улугбека» і інш.). Узнаг. 2 ордэнамі.

БУРШТЫН, *янтар* (літ. gintāras), выкапнёвая смала хваёвых дрэў неагенавага і палеагенавага перыядаў. Мае 79% вугляроду, 10 кісларoду, 11% вадароду, прымесі серы і інш. Колер жоўты і жоўта-чырвоны. Празрысты. Цв. 2,2—2,5; шчыльн. 1050—1100 *кг/м*³. Гарыць, *t* пл. 300 °С. Электрызуецца ад трэння. Сустракаецца ў выглядзе жаўлакоў і нават глыбаў (часам з выкапнёвымі насякомымі і членістаногімі) у алігацэнавых адкладах на ўзбярэжжах Балтыйскага (Калінінградская вобл.) і Белага мораў, на Пн Сібіры, на Украіне, Брытанскіх а-вах, у ЗША, Канадзе. Выкарыстоўваецца здаўна ў ювелірнай справе. Упрыгожанні з Б. былі вядомыя ў Ст. Егіпце і Рыме, на Украіне (позненалеалітычныя стаянкі). Ідзе на выраб бурштынавай (янтарнай) к-ты, электраізалятараў, лакаў і інш. На Беларусі перспектыўная на выяўленне Б. Брэсцкая вобл.

БУРШТЭЙН Майсей Ісакавіч [н. 24.3(5.4). 1889, г. Смаргонь Віленскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне садоўніцтва. Д-р с.-г. н. (1944), праф. (1922). Скончыў Нова-Александрыйскі ін-т сельскай і лясной гасп. (Люблінская губ.). Загадваў кафедрай садоўніцтва Горацкага с.-г. ін-та (1922). Выяўляў каштоўныя мясцовыя сарты пладовых культур для закладкі калектыўных садоў, вывучаў уплыў прышчэпы на прышчэпак, падбіраў прышчэпы для закладкі гадавальнікаў. Абследаваў многія раёны БССР і РСФСР, што памагала вырашаць пытанне пра выбар месца для закладкі садоў з улікам рэльефу мясцовасці і прыроднага дрэнажу.

Тв.: Асновы пладоўніцтва Беларусі, Мн., 1929; Садоводство в укрупненных колхозах Владимирской области, Владимир, 1952.

БУРЫ ВУГАЛЬ, выкапнёвы вугаль нізкай ступені метамарфізму. Утвараецца на стадыі пераходу ад выкапнёвага торфу да каменнага вугалю. Адрозніваюць: *лігніт* з добра захаванай структурай дрэў і інш. раслін, рыхлы карычневы вугаль зямлістай тэкстуры і шчыльны чорны бліскучы. Мае да 78% вугляроду, 5—6 вадароду, да 50% лятучых кампанентаў; вільготнасць да 50%. Шчыльн. 1100—1200 *кг/м*³. Цеплатворная здольнасць 3500—7400 *ккал/кг*. Энергетычнае паліва, сыравіна для вырабу вадкага паліва. Па прынятай у СССР класіфікацыі Б. в. падзяляюцца на тры тэхнал. групы: Б-1 (вільготнасць да 40%), Б-2 (да 30—40%) і Б-3 (менш за 30%). Самыя буйныя радовішчы і басейны Б. в. характэрны мезазойскаму і кайназойскаму ўзросту. У СССР запасаў Б. в. амаль 3,5 трыльёна *т*. Значная колькасць іх скангутнасцю 60—90 *м*; большасць прыгодныя для адкрытай здабычы. Найб. басейны ў СССР: Ленскі, Канска-Ачынскі, Тургайскі, Паўднёва-Уральскі, Падмаскоўны, Дняпроўскі. За мяжою найбольш Б. в. здабываецца ў ГДР, ФРГ, ЧССР. На Беларусі вуглепраяўленні ёсць у Гомельскай і Брэсцкай абл.

Літ.: Жемчужников Ю. А. и Гинзбург А. И. Основы петрологии углей, М., 1960; Зикеев Т. А. Справочник по качеству ископаемых углей и горючих сланцев Советского Союза, М., 1957; Гапеев А. А. Твердые горючие ископаемые (каустобиолиты), М., 1949.

БУРЫ ЖАЛЯЗНЯК, мінер. ўтварэнне з тонкадысперснай сумесі гідравокіслаў і вокіслаў жалеза (гётыту, гідрагётыту, *гематыту*, гідрагематыту, лепідакракіту і інш. мінералаў).

Трапляецца ў выглядзе вямлістых скрытакрышталічных мас, нацёкаў, канкрэцый, жвод, аалітаў, псеўдамарфоз па інш. мінералах і выкапнёвых арган. рэштках. Колер ад бура-жоўтага да чорнага. Паходжанне асадкавае або эпігенетычнае. Утвараецца ў прыбярэжных частках марскіх і азёрных басейнаў у выніку хім. і біяхім. асаджэння (гл. *Асадкавыя радовішчы*). Вялікія масіВ. ж. ўзнікаюць у зонах акіслення сульфідных (медных, поліметалічных, волата-мыш'яковых і інш.) радовішчаў *(жалезныя капелюшы)* або пры выветрыванні карбанатных, сілікатных і магнетыта-кварцавых рудаў жалеза. В. ж. — адна з пашыраных, прамыслова важных, эканамічна жалезных рудаў (пры ўтрыманні жалеза больш за 30—35%). Найбуйнейшыя радовішчы ў СССР (Заходне-Сібірскі басейн, Лісакоўскае, Халілеўскае, Сероўскае, Алцікае, Керчанскае), Францыі (Латарынгскае), на Кубе (Маяры), у Новай Каледоніі. На Беларусі пашыраны ў саставе *балотных рудаў*.

БУРЫ МЯДЗВЕДЗЬ, гл. *Мядзведзь*.

БУРБІНСКІ Яўген Фёдаравіч [6(18).11. 1849—1912], рускі вучоны-крыміналіст, адзін са стваральнікаў навуковай і судовай фатаграфіі. З 1889 судовы эксперт Пецярбургскага акруговага суда. Распрацаваў метад выяўлення тэкстаў, недаступных непасрэднаму зроку, аналізам ўспрыманню. Займаўся раскрыццём тэкстаў на струхлелых скураных дакументах 14 ст., знойдзеных у Маскоўскім Крамлі.

Тв.: Записка об усовершенствованиях, достигнутых в фотографии, «Известия императорской Академии наук», 1896, т. 4, № 3; Судебная экспертиза документов, производство ее и пользование ею, СПб., 1903.

Літ.: Тервиев Н. В., Е. Ф. Бурбинский и его значение в криминалистике, «Ученые записки Всесоюзного юрид. заочного ин-та», 1948, в. 1.

БУРЫЯ ВОДАРАСЦІ (Phaeophyta), аддзел водарасцей, у якіх, акрамя хларафілу, ёсць пігменты каратыноіды, ксантафіл і фукаксанцін. Розныя суадносіны гэтых пігментаў у храматафорах абумоўліваюць колер водарасцей (ад аліўкава-зялёнага да цёмна-бурага).

Слаявіна Б. в. шматклетачная, розная будовы (ніткападобная або пласцінчатая) і памеры (ад некалькіх сантыметраў да дзесяткаў метраў), прымацавана да дна кораненадобнымі выростамі — рызоідамі. Клеткі Б. в. аднаядравыя з цэлюлознымі абалонкамі, насычанымі пекцінавымі рэчывамі. Размнажэнне полавае (аагамія, гетэрагамія, ізагамія) і бясполае (з дапамогай заспораў). У большасці Б. в. чаргуюцца бясполае і полавае пакаленні. Прадукты асіміляцыі ў Б. в. — простыя цукры (глюкоза, маніт і інш.), але крухмал не ўтвараецца. Вядома 240 родаў, якія аб'ядноўваюць 1500 відаў. Усе яны марскія, пашыраны каля берагоў у халодных і цёплых морах Атлантычнага і Ціхага акіянаў.


Б. в. — ежа марскіх жывёл і падзейнае сховішча маляўкам рыб. З іх атрымліваюць альгін, ёд, калійныя солі, ацэтон, цэлюлозу, спірт, воцатную к-ту. Выкарыстоўваюць на корм свойскай жывёле і на ўгнаенне. Ламінарыя (марская капуста), аларыя ўжываюцца ў медыцыне і як прыправа да страў. Гл. таксама арт. *Водарасці* і іл. на ўкл. пры ім.

Н. І. Сраженская. Мінск.

БУРЫЯН (Burian) Эміль Францішак (11.6. 1904, Пльзень — 9.8.1959), чэхаславацкі рэжысёр, кампазітар, драматург. У 1923 пачаў творчую дзейнасць як кампазітар. Аўтар 8 опер і 4 балетаў, сімф. і камерна-інстр. твораў, музыкі да спектакляў, кінафільмаў. З 1929 выступае як рэжысёр драм. т-ра. Заснаваў у 1933 т-р «Д-34» (Прага). За прагрэс., востра сатырычную накіраванасць яго спектакляў, крытычныя адносіны самога Б. да паліт. рэжыму ў Чэхаславакіі фашысты закрылі т-р, Б. кінулі ў канцлагер. У пасляваен. творчасці шукае новых выразных сцэнічных формаў, надае вялікае значэнне музыцы. Перапрацаваў для сцэны літ. творы і паставіў спектаклі «На кірмашы», «Кожнаму па заслугах», «Пацукалоў», «Яўген Анегін», «Опера жабракоў», «Швейк», «Вера Лукашова» і інш. У 1934, 1952 і 1958 з т-рам прыязджаў у Маскву.


Тв.: O nové divadlo. 1930—1940, 2 vyd., Praha, 1946.

БУРЭННЕ, праходка свідравін у зямной кары для разведкі карысных выкапняў або здабычы вадкасці ці газу. Робіцца таксама для свідравання шпураў (свідравін малой глыбіні) пры бура-ўзрыўных работах. Свідравіны пры Б. робяцца паслядоўным разбурэннем горных парод з выдаленнем матэрыялаў на паверхню. Паводле характару бурэння горнай пароды адрозніваюць два метады Б.: ударнае і вярчальнае. Пры ўдарным парода ў забоі крышыцца ўдарамі спец. інструмента. У БССР ударнае Б. часам выкарыстоўваецца пры праходцы гідрагеалагічных свідравін. Пры вярчальным метадзе свідравіны робяць долатам (рыс. 1), якое круціцца рухавіком. Вярчальнае Б. падзяляецца на ротарнае (рухавік знаходзіцца на паверхні і круціць долата ў забоі праз калону бурыльных трубаў), турбіннае і электрабуравое (рухавік ставіцца над долатам і апускаецца ў забой). Пры праходцы свідравін на нафту і газ у БССР выкарыстоўваецца ротарнае і турбіннае Б., на інш. карысныя выкапні — ротарнае. Б. шпураў глыб. да 5 *м* робіцца пнеўматычнымі малаткамі (перфаратарамі), да 500 *м* — бураВымі станкамі, больш глыбокія свідравіны — стацыянарнымі буравымі ўстаноўкамі.



Рыс. 1. Долата буравое.

Пачатак Б. свідравін на Русі адносіцца да 9 ст. (здабыча салян. раствору, Старая Руса). Прамысл. Б. робіцца з 1831, калі ў Адэсе прабурылі 4 свідравіны, каб атрымаць пітную ваду; іх глыб. ад 36 да 189 *м*. Першую свідравіну на нафту прабурылі ў Баку (1848). З 1859 замест конных цягі пры Б. карыстаюцца паравым рухавіком. Вынайдзены рус. інжынерамі ў 1890 турбабур даў пачатак турбінаму Б., якое стала асн. спосабам бурэння на нафту ў СССР. З 1940 В. робіцца электрабурам (долата прыводзіцца ў дзеянне эл. рухавіком), вынайдзеным сав. вучонымі. На моры Б. ажыццяўляецца з рухомых або стацыянарных пляцовак. Пашыраюцца метады нахіленага Б. і карыстанне алмазнымі інструментамі. Перадавая тэхналогія Б., распрацаваная сав. вучонымі і інжынерамі, дае магчымасць бурыць свідравіны глыб. да 6 км і больш (1969). На Беларусі да 1938 практыкавалася толькі ручное Б. свідравін (30—50 *м*) з мэтай геал. вывучэння тэр. рэспублікі. У 1939, каб выявіць салянасныя структуры ў межах Прыпяцкай упадзіны, пачалі Б. глыбокай свідравіны калля в. Давыдаўка (Гомельская вобл.). На глыб. 844 *м* ускрылі салянасныя адклады дэвону. З 1940 Б. асобных каланкавых свідравін глыб. 200—300 *м* праводзілася і ў інш. раёнах. У 1947 на тэр. Прыпяцкага прагіну пачалі В. апорнай свідравіны Карэнеўская 1-Р, каб выявіць геал. будову ўпадзіны. Свідравіну рабілі ротарным спосабам, глыб. ле 2800 *м*. Пасля адкрыцця на тэр. Беларусі багатых радовішчаў калійнай солі (1949) і нафты (1964) прабураны свідравіны глыб. да 4500 *м*. З 1969 В. ў рэспубліцы праводзіцца для пошукаў і распрацоўкі нафтавых радовішчаў, падземных водаў, руды, солі, а таксама пры інж.-меліярац., геолагаздымачных і выбуховых работах. Асн. частка ротарнай буравой установкі (рыс. 2): буравая вышка (*1*), талевы блок (*2*), вяртлюг (*3*), квадратная труба-штанга (*4*), ротар (*5*), лябёдка (*6*), рухавік (*7*), бурыльныя трубы (*8*), долата (*9*). Ротар ставяць у цэнтры буравой вышкі. Бурыльныя трубы і квадратная штанга пустацелыя. Квадратная штанга верхнім канцом злучаецца з вертлюгом. Ніжняя яго частка, злучаная з квадратнай штангай, можа круціцца разам з калонай бурыльных трубаў, а верхняя — нерухомая. Да гарлавіны нерухомай часткі прымацоўваецца шланг, па якім у працэсе Б. пампуецца ў свідравіну па буравых трубах прамывачная вадкасць (глініста раствор). Выцякаючы праз адтуліны ў долаце, вадкасць прамывае забой і па кальцавой прасторы паміж сценкамі свідравіны і трубы падаецца на паверхню. Пры турбінным Б. прамывачная вадкасць адначасова круціць турбабур. У час бурэння калона трубаў вісіць на круку вышкі і апускаецца пры паглыбленні долата ў пароду. Калі свідравіна дасягае глыб. 600 *м*, апускаюць кандуктар, каб перакрыць слабыя (нявстойлівыя) пароды ці грунтавыя воды. Далей робяць цементаванне, г. зн. напампоўваюць цементны раствор паміж сценкамі кандуктара і свідравіны. Пасля таго як цэмент зацвярдзее, В. аднаўляюць. У свідравіну апускаюць долата меншага дыяметра і робяць Б. да праектнай глыбіні. Калі свідравіна прабурана, апускаюць калону абсадных (эксплуатацыйных) трубаў. Цементаванне свідравіны — канчатковая аперацыя Б.



Рыс. 2. Буравая ўстаноўка.

Літ.: Шацов Н. И. и др. Бурение нефтяных и газовых скважин, М., 1961; Вадецкий Ю. В. Бурение нефтяных и газовых скважин, 2 изд., М., 1967. *Ю. В. Вадзецкі.* Мінск.

БУР'ЯН Барыс Іванавіч (н. 7.1.1924, Масква), савецкі крытык і празаік. Піша на рус. і бел. мовах. Да Айч. вайны акцёр у тэатрах Разані і Іванава. У 1941—45 на фронце. Пасля вайны — у рэдакцыях газет і часопісаў у Мінску. Літ. дзейнасць пачаў у 1946 з тэатр. рэцэнзій. Аўтар артыкулаў пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, П. Панчанкі, А. Куляшова, В. Таўлая, Я. Брыля і інш., аповесцяў «Першы снег» (1957), «Ля сіняй бухты» (1959), «Вальс Грыбаедава» (1960), творчых партрэтаў акцёраў (з І. Ліснеўскім: «На вы-

сокім узлёце», 1962; «На тэатральных скрыжаваннях», 1967). Перакладаў на рус. мову творы К. Чорнага, М. Лынькова, А. Васілевіч, І. Грамовіча і інш.

Тв.: Радужный перезвон, Мн., 1964; У синей бухты.— Вальс Грибоедова.— Твоя повесть, Мн., 1966.

БУСЕЛЬНІК, грабелькі (Erodium), род адна- або двухгадовых травяністых раслін сям. гераніевых. Сцябло распасцёртае або ўзнятае, з валаскамі, выш. 8—50 *см*. Лісце перыстараздзельнае. Кветкі дробныя, ружова-пурпуровыя або ліловыя. Суквецце — паўпарасонік. Плод — каробачка, укрытая прыціснутымі цвёрдымі валаскамі. Вядома 60 відаў, пашыраных ва ўсіх частках свету. У СССР 20 відаў, на Беларусі адзін — Б. цыкутовы (E. cicutarium, нар. назвы: дажджоўнік, жабнік, грабеньчыкі, сушчэннік, чарвівец). Расце на палях і агародах як пустазелле. Мае дубільныя рэчывы, вітамін С. Лекавая расліна.



Бусельнік цыкутовы: *1* — галінка з лісцем, пладамі і кветкамі; *2* — асобны плодзік.

БУСЛАЕЎ Фёдар Іванавіч [13(25).4.1818, г. Керанск Пензенскай губ. — 31.7(12.8).1897], рускі мова- і мастацтвазнавец. Акад. (1881), праф. Маскоўскага ун-та (1847). У мовазнаўчых працах трымаўся параўнальна-гістар. метаду, імкнуўся вызначыць сувязь гісторыі мовы з жыццём народа («Пра выкладанне айчыннай мовы», ч. 1—2, 1844; «Пра ўплыў хрысціянства на славянскую мову...», 1848). Вывучаў рус. і зах.-еўрап. мастацтва, л-ру Кіеўскай Русі і фальклор. Спачатку быў прыхільнікам міфалаг. школы, потым далучыўся да т. зв. школы запазычання і даводзіў, што радзімай еўрап. фальклору з'яўляецца Усход. У працах выкарыстоўваў факты з бел. мовы; разглядаючы бел. прыказкі і прымаўкі, тлумачыў бел. словы; выдаваў стараж. рукапісы, каменціраваў тэксты стараж.-бел. помнікаў.

Тв.: Соч., т. 1—3, СПб. — Л., 1908—30; Историческая грамматика русского языка, М., 1959.

БУСЛАЎ Казімір Паўлавіч [н. 12(25).10. 1914, в. Кашалёва Буда-Кашалёўскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі філосаф. Чл.-кар. АН БССР (1969), д-р філас. н. (1965), праф. (1966). Чл. КПСС з 1943. Скончыў Смаленскі пед. ін-т (1938), Выш. парт. школу пры ЦК КПСС (1947), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1951). У 1938—45 настаўнік, супрацоўнік Беларускага радыё. У



1944—48 лектар ЦК КП(б)Б. У 1951—53 заг. аддзела л-ры і мастацтва, у 1953—56 заг. аддзела навукі і культуры ЦК КПБ. З 1956 дырэктар Ін-та філасофіі і права АН БССР. Аўтар прац у галіне гістар. матэрыялізму. Распрацоўвае праблемы грамадскага прагрэсу, гуманізму і культуры.

Тв.: Вопросы исторического материализма в трудах Ленина и Сталина 1921—1923 гг., Мн., 1953; Свобода должна быть свободой на деле, Мн., 1961; Проблемы социального прогресса в трудах В. И. Ленина (1917—1923 гг.), Мн., 1963; О критерии внутриклас. различий в СССР, Мн., 1965; Назначение человека и смысл его жизни, Мн., 1967.

БУСЛЫ (Ciconiidae), сям. птушак атрада галянастых. На Беларусі 2 віды: *белы бусел* і *чорны бусел*.

БУСЫГІН Аляксандр Харытонавіч (н. 10.6. 1907, в. Каляватаўская Вятлужскага пав. Кастрамской губ.), каваль Горкаўскага аўтазавода, адзін з пачынальнікаў стаханаўскага руху ў аўтамаб. прамысловасці. Чл. КПСС з 1938. У 1935 устанавіў рэкорд, выкаваўшы за змену 966 каленчатых валоў пры норме 675, а пасля зменную выпрацоўку давёў да 1146. З вер. 1937 да лют. 1939 слухач Прамакадэміі ў Маскве. З 1946 нач. рысорнага цэха, з 1948 да 1959 нач. кузні № 2 рамонтна-мех. корпуса аўтазавода. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га і 2-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалём.

БУСЯЖ, вёска ў Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Суворава. За 22 *км* на ПнЗ ад Івацэвіч, 165 *км* ад Брэста, 18 *км* ад чыг. ст. Косава-Палескае. 162 ж., дварoў 47 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін.

БУТАДЫЁН (дывініл), C_4H_6, непасычаны вуглевадарод раду C_nH_{2n-2}. Прадстаўнік *дыенавых вуглевадародаў*, мае дзве спалучаныя падвойныя сувязі $CH_2{=}CH{-}{-}CH{=}CH_2$. Бясколерны газ з характэрным пахам, *t* пл. −108,9 °С, *t* кіп. −4,5 °С, шчыльн. 0,650 *кг/м*³. Дрэнна растваральны ў вадзе, добра ў эфіры. З ацэтальдэгідам і аміякам утварае азеатропныя сумесі, з паветрам — выбуховыя (1,6—10,8% Б. па аб'ёме). Найб. характэрная рэакцыя далучэння. Здольны да палімерызацыі з утварэннем высокамалекулярных злучэнняў. У прамысловасці атрымліваюць з спірту (метад С. В. Лебедзева), з бутану ці ацэтылену. Б. — гал. сыравіна ў вытворчасці сінт. каўчуку.

БУТАДЫЁНАВЫ КАЎЧУК, адзін з сінтэтычных каўчукоў. Высокамалекулярнае злучэнне, якое атрымліваюць палімерызацыяй *бутадыену* пры паляўнасці каталізатараў. У залежнасці ад прыроды каталізатара і ўмоў, пры якіх вядзецца працэс палімерызацыі, выпрацоўваюцца розныя тыпы Б. к. з малекулярнай масай ад 10 000 да 900 000. Прамысл. выраб Б. к. ўпершыню наладжаны ў СССР у 1932 паводле метаду С. В. Лебедзева.

Б. к. належаць да каўчукоў агульнага прызначэння і выкарыстоўваюцца ў шыннай, гумавай, абутковай і інш. прамысловасці пераважна ў выглядзе гумы, якую атрымліваюць з іх *вулканізатаў* серай у прысутнасці сульфенамідаў. Да гумавай сумесі дадаюць *напаўняльнікі* (сажу), пла-

паляпшае фіз.-мех. ўласцівасці гумы. Б. к. водаі газанепранікальны. Па супраціўленні цеплавому старэнню і па трываласці гума з Б. к. лепшая, чым з натуральнага. Спец. тыпы Б. к. ідуць на выраб марозаўстойлівых шын. Гл. таксама *Каўчук, Гума*.

Літ.: Литвин О. Б. Основы технологии синтеза каучуков, 2 изд., М., 1964, с. 326—333; Кошелев Ф. Ф., Корнев А. Е. и Климов Н. С. Общая технология резины, 3 изд., М., 1968.

І. Ф. Асіпенка. Мінск.

БУТАДЫЕН, лякарства. Вытворнае піразалону. Абязбольны, гарачкапаніжальны і процізапаленчы сродак. Жаўтаваты крышталічны парашок, дрэнна растваральны ў вадзе. Ужываецца ўнутр (парашкі і таблеткі) супраць раўматызму, інфекцыйных і неспецыфічных поліартрытаў. Проціпаказаны пры язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, недастатковасці кровазвароту II і III ступені, хваробах крыві, печані, нырак.

БУТАН, гл. *Насычаныя вуглевадароды*.

БУТАН, феад. княства над пратэктаратам Індыі, ва ўсх. частцы Гімалаяў. Пл. 41,4 тыс. *км*². Нас. 770 тыс. чал. (1967), пераважна бхутыя (бхотыі) — народ бліакі да тыбетцаў, па веравызнанні — будысты. Сталіца Тхімпху. Увесь Б. займаюць горы, прарэзаныя з Пн на Пд глыбокімі далінамі. Клімат вільготны, трапічны ў падножжы і ніжняй частцы гор, вышэй — халаднейшы.

Некалькі стагоддзяў Б. васальна залежаў ад Тыбета, часамі — ад Кітая. У 1841 за штогадовую выплату 50 тыс. рупій англічане ваявалі горнымі пераходамі на асама-бутанскай граніцы, у 1907 зрабілі ў Б. дзярж. пераварот, паставілі правіцелем свайго агента Угай-ен-Вангчука. Паводле дагавору 1910 кіраўніцтва знешнімі зносінамі Б. перададзена англа-інд. уладам. Пасля абвяшчання (1947) незалежнасці Індыі апошняя заключыла з Б. дагавор, паводле якога ўзяла на сябе адказнасць за яго знешнія зносіны і абарону. З 1949 Б.— пратэктарат Індыі, але фактычна залежыць ад англ. імперыялізму. З прычыны шматлікіх парушэнняў бутанскай граніцы Кітаем Індыя ўвяла (1966) у Б. свае войскі. У 1953 кароль Вангчук заснаваў Нац. асамблею, неўзабаве адмяніў прыгоннае права, у маі 1968 абвясціў пра ўвядзенне канстытуцыйнай манархіі.

Асн. занятак насельніцтва — вырошчванне рысу, кукурузы, проса, ячменю, пшаніцы, агародніны, садавіны, бавоўніку. Гадоўля коней, якаў, авечак, свіней. Нарыхтоўка каштоўнай драўніны. Ручное прадзіва і ткацтва. З дапамогай Індыі будуюцца аўтамаб. дарогі, ГЭС, папяровая ф-ка.

БУТАФОРЫЯ (ад італьян. buttare кідаць+ + fuori па-за, вонкі), 1) падробленыя прадметы (скульптура, мэбля, дэталі касцюма, аздабленні і інш.), якімі карыстаюцца ў спектаклях замест сапраўдных. Вырабляюцца з кардону, пап'е-машэ, дрэва, бляхі, палатна, пенапласту. Б. таксама выкарыстоўваецца ў панарамах, экспазіцыях выставак, вітрынах, для рэкламы. 2) У пераносным значэнні — мішура, падробленая раскоша.

БУТКЕВІЧ Красцьян Ягоравіч (г. н. невяд., каля Шклова — 2.10.1846), беларускі і рускі артыст балета. Да 1800 прыгонны танцор *Шклоўскага тэатра Зорыча*, да 1825 першы пантамімны танцоўшчык балетнай трупы Пецярбургскага імператарскага т-ра. У 1822 адпушчаны на волю. З асаблівым поспехам выступаў у рус. балетах. Асн. партыі: Сцяпан («Вызваленне маладой сялянкі, ці Храбрасць рускага салдата»), Анкундзін («Млынар — чараўнік, падманшчык і сват»; лібрэта балетаў і пастаноўка Агюста, абодва 1822); Іпат («Што даўней, тое і цяпер», 1822), Штурман («Казак у Лондане», муз. К. Каваса, лібрэта і паст. Агюста, 1823), Гірэй («Каўказскі нявольнік, ці Цень нявесты» на сюжэт А. Пушкіна, муз. Каваса, лібрэта і паст. Ш. Дзідло), Пасол Казарскі («Руслан і Людміла, ці Зрынуццё Чарнамора — злога чараўніка» на сюжэт Пушкіна, муз. Штольца, лібрэта і паст. Агюста і Дзідло, 1824).

БУТКЕВІЧ Леанід Уладзіміравіч (н. 31.12. 1918, в. Хотліна Лепельскага пав. Віцебскай губ.), Герой Сав. Саюза (1943). З сям'і чыгуначніка. Скончыў Аршанскі чыг. тэхнікум (1935), працаваў на чыгунцы. На фронце з 1941, снайпер. Знішчыў 327 фаш. салдатаў і афіцэраў, 22 кулямётныя кропкі ворага, падарваў 125 снайпераў. Жыве ў Есентуках.



БУТЛЕРАЎ Аляксандр Міхайлавіч [25.8(6. 9).1828, г. Чыстапаль Казанскай губ. — 5(17). 8.1886], рускі хімік, стваральнік тэорыі хім. будовы, што ляжыць у аснове сучаснай арганічнай хіміі (гл. *Хімічнай будовы тэорыя*). Акад. Пецярбургскай АН (1874). Ганаровы чл. многіх рускіх і замежных навук. устаноў і т-ваў. Вучань М. М. *Зініна*, стварыў школу хімікаў-арганікаў. У 1850—68 працаваў у Казанскім, з 1869 у Пецярбургскім ун-тах. Працы па арган. сінтэзе і тэорыі хім. будовы. Сінтэзаваў ёдаісты метылен, «дыоксіметылен» (палімер фармальдэгіду), уратрапін, цукрыстае рэчыва метыленітан (акрозу), трыметылкарбінол, даказаў паляўнасць ізамерыі ў насычаных вуглевадародах. У 1861 стварыў тэорыю хім. будовы арган. рэчываў, у 1864—66 выдаў кнігу «Уводзіны да поўнага вывучэння арганічнай хіміі», дзе тэорыя хім. будовы ўпершыню пашырана на ўсе класы арган. злучэнняў.



Тв.: Соч., т. 1—3, М., 1953—58.

Літ.: Арбузов А. Е., А. М. Бутлеров — великий русский химик. К 100-летию теории химического строения, М., 1961; Быков Г. В. Александр Михайлович Бутлеров. Очерк жизни и деятельности, М., 1961.

БУТМІРСКАЯ КУЛЬТУРА, познанеаліты чная культура (2800—2600 да н. э.). Назва паходзіць ад стаянкі Бутмір (Югаславія). Знойдзены рэшткі паўаямлянкавых жытлаў,

майстэрні для вырабу крамяпёвых прылад працы, посуд са спіральным арнаментам, бытавыя рэчы. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй. Плямёны Б. к. мелі цесныя сувязі з плямёнамі дунайскай і эгейскай культур.

БУТБЛКІН Віктар Васілевіч (н. 27.10. 1923, Масква), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Д-р ваен. н., інж.-палкоўнік. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся 15.10.1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. Лодка, на якой камандзір батарэі ст. лейтэнант Б. перапраўляўся з тэлефаністамі і рацыяй, была падбіта. Б. выцягнуў з вады параненых салдатаў і рацыю. Пад абстрэлам ворага карэкціраваў агонь сваёй батарэі, якая знішчыла 16 агнявых кропак праціўніка, 1 артыл. і 2 мінамётныя батарэі, адбіла 20 варожых контратак. Жыве ў Маскве.

БУТЭЛІН Леанід Георгіевіч (1919, в. Родня Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ. — 22.6. 1941), лётчык-знішчальнік, які ў Айч. вайну адзін з першых тараніў варожы самалёт. З сялян. Напярэдадні вайны лейтэнант, камандзір звяна 12-га знішчальнага палка. У першы дзень Вял. Айч. вайны, 22.6.1941 у 5 *гадз* 15 *мін*, каля г. Станіслаў збіў самалёт праціўніка і, калі скончыліся боепрыпасы, тараніў другі.

БУФАЛА (Buffalo), горад на ПнУ ЗША ў штаце Нью-Йорк. Размешчаны на ўсх. беразе воз. Эры ў вытоку ракі Ніягары на скрыжаванні водных шляхоў, чыгунак і аўтамаб. дарог. Порт, даступны для вял. марскіх суднаў, гадавы грузаабарот каля 20 млн. *т*. Аэрапорт. 1332 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1966). Адзін з галоўных гандлёвых і індустр. цэнтраў ЗША, важны цэнтр мукамольнай прамысловасці. ГЭС на р. Ніягара. Чорная і каляровая металургія, нафтаперапр., ваенная прамысловасць. Прадпрыемствы Б. выпускаюць гумавыя вырабы, хімікаты, эл. рухавікі, эл. апаратуру, тэлевізары, машыны, прадукты харч. прамысловасці. Ун-т (з 1846). Маст. галерэя, музеі.

БУФАНАДА (італьян. buffonata жарт), камедыйны прыём акцёрскай ігры. Б. ўласцівы рэзкія перавелічэнні, імкненне максімальна падкрэсліць вонкавыя характэрныя прыкметы персанажа, вострая знешняя дынаміка. Б. ўзнікла ў пар. тэатры (мім, скамарохі, італьян. камедыя дэль артэ). Выкарыстоўвалася ў літ. драме (Мальер, А. Сухаво-Кабылін, У. Маякоўскі і інш.). Выдатнымі майстрамі Б. былі рускія акцёры Я. Шумскі, В. Жывакіні і інш. Б. пашырана ў цырку.

БУФЕРНЫ РАСТВОР (буферная сумесь), раствор слабой кіслаты ці асновы са сваёй соллю, у якім вадародны паказчык pH амаль не мяняецца пры змене канцэнтрацыі раствору або пры дабаўленні да яго невял. колькасці к-ты ці шчолачы. Б. р. адыгрываюць важную ролю ў жыццёвых працэсах, многія з якіх адбываюцца толькі пры пэўных pH. Пастаянства pH у жывым арганізме падтрымліваецца Б. р. (напр., пастаянства pH крыві — Б. р. з карбанатаў і фасфатаў). Ужываюцца Б. р. ў розных галінах хіміі.


БУХАВЕЦ Георгій Кліментавіч [5(18).1. 1901, Віцебск — 27.5.1967], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1923. З 13 гадоў быў дрывасекам, пастухом, шліфоўшчыкам шкла ў Віцебску. У Чырв. Арміі з 1920. Ваяваў на Зах. фронце. Скончыў Віцебскія пяхотныя камандныя курсы (1922), курсы «Выстрал» (1938), Вышэйшыя акад. курсы пры Ваен. акадэміі. Ген. штаба (1948). З 1938 нач. штаба стралк. корпуса. Удзельнічаў у вызваленні Зах. Беларусі (1939). У Айч. вайну на Паўн.-Зах., Ленінградскім, 3-м Бел., 1-м Укр. франтах: нач. штаба стралк. корпуса, камандзір дывізіі, нач. штаба арміі. З 1945 нач. штаба Харкаўскай і Таўрыйскай ваен. акруг. У 1952—53 нач. штаба Прыволжскай ваен. акругі. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



БУХАВІЧЫ, вёска ў Яроміцкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Мухавец. Цэнтр калгаса «Перамога». За 7 *км* на ПнЗ ад Кобрына, 55 *км* ад Брэста, 8 *км* ад чыг. ст. Кобрын, на шашы Масква — Брэст. 238 ж., двароў 87 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, адда. сувязі, магазін. Першыя звесткі пра Б. адносяцца да 1563.

БУХАРА, горад, цэнтр Бухарскай вобл. Узб. ССР, у даліне р. Зераўшан, на канале Шахруд. Чыг. ст., аэрапорт. 112 тыс. ж. (1970).

Маўзалей Ісмаіла Самані ў Бухары.




Паводле археал. звестак Б. заснавана каля 1 ст. У летапісах упамінаецца з 5 ст. Вялікі рамесны і культурны цэнтр Сярэд. Азіі. У 16 — пач. 20 ст. сталіца Бухарскага ханства. З 1868 у складзе Расійскай імперыі. У выніку пар. паўстання 2.9.1920 у Б. скінута ўлада эміра. З кастр. 1920 сталіца Бухарскай Нар. Савецкай Рэспублікі, з 1924 цэнтр Зераўшанскай акр., з 1938 Бухарскай вобласці.

Бавоўнаачышчальны, каракулевы, грэнажны, механічны, рамонтна-механічны, асфальтава-бітумны, вінаробчы з-ды, домабудаўнічы камбінат; шоўкамотальная, прадзільная, швейная, абутковая, макаронна-кандытарская ф-кі, мясакамбінат, алейна-экстракцыйны з-д. Са стараж. часоў вядомы залаташвейны, шоўкаткацкі промыслы, чаканка на медзі і інш. Стараж. помнікі Б.: маўзалей Ісмаіла Самані (9—10 ст.), медрэсэ Улугбека (1417), ансамбль медрэсэ Міры-Араб (1535—36) і саборнай мячэці Калян (1514) з мінарэтам (1127), медрэсэ Абдулаазіз-хана (1651—52). У 18—19 ст. высокія маст. традыцыі захоўвае нар. дойлідства. Пед. ін-т, агульнатэхн. ф-т Ташкенцкага політэхн. ін-та, 8 сярэд. спец. навуч. устаноў. Муз.-драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

БУХАРСКАЕ ХАНСТВА, феадальная дзяржава ў Сярэдняй Азіі ў 16—20 ст.

Заснавана узбекскім ханам Мухамедам Шэйбані на месцы былой дзяржавы Цімурыдаў. Названа Б. х. у канцы 16 ст., калі сталіцу з Самарканда перанеслі ў Бухару. Значна ўзмацнілася пры Абдуле-хане II (1557—98), завалявала Ташкент, Фергану, Харэзм, Герат і інш., наладзіла гандл. і дыпламат. адносіны з Рус. дзяржавай. У час праўлення дынастыі Аштарханідаў (1599—1753) Б. х. прыйшло ў заняпад, выкліканы сепаратысцкімі імкненнямі феадалаў і войнамі з Іранам, Хівінскім ханствам, казахамі і інш. У 1740 Б. х. завалаваў іранскі шах Надзір. У 1753 ханства зноў стала самастойнае, хан Мухамед Рахім абвясціў сябе эмірам, але феад. раз'яднанасць асталася. Сялянне, амаль паўсюдна пазбаўленыя зямлі, карысталіся ёю на правах здольшчыны. Працоўныя паўставалі супраць феад. прыгнёту (1821—25, 1885). Паводле дагавораў 1868 і 1873 Б. х. трапіла ў васальную залежнасць ад Расіі, працоўныя падналі пад двайны прыгнёт — эміра і цара. Аднак далучэнне да краіны з больш высокім эканам. і культ. узроўнем мела пэўнае прагрэс. значэнне.

Кастр. рэвалюцыя змяніла лёс працоўных Б. х. У 1918 створана Бухарская Камуніст. партыя, якая арганізавала і ўзначаліла барацьбу працоўных супраць прыгнятальнікаў. У вер. 1920 Чырв. Армія на чале з М. В. Фрунзе намагла працоўным Бухары скінуць эміра. Сярод чырвонаармейцаў былі і беларусы, адзін з іх, Э. І. Стасевіч, выбраны чл. Усебухарскага ЦВК. 8.10.1920 1-ы Усебухарскі народны курултай абвясціў стварэнне на тэр. эмірата Бухарскай Народнай Савецкай Рэспублікі (БНСР). *М. І. Іоська.* Мінск.



БУХАРСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Узбекскай ССР. Утворана 15.1.1938. Пл. 143,2 тыс. км². Нас. 934 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 11 раёнаў; 3 гарады, 9 гарадскіх пасёлкаў. Цэнтр г. Бухара.

Паверхня — хвалістая раўніна, на большай частцы яе пустыня Кызылкум. У цэнтры асобныя ўзвышшы — Тамдытау, Букантау, Сангрунтау і інш. — выш. да 922 м, г. Актау. На ПдУ горы Каратау і адгор'і Зераўшанскага хр. Карысныя выкапні: нафта, газ, азбест, гіпс, спажыўная соль, графіт, мармур. У Кызылкуме знойдзена радовішча золата. Клімат сухі, кантынентальны, сярэдняя т-ра студз. ад —5 на Пн да 0 °С на Пд, ліп. адпаведна 27,5 і 30 °С. Ападкаў ад 50 *мм* на ПнЗ да 150 *мм* на ПдУ за год. Вегет. перыяд каля 220 дзён. Гал. рака Зераўшан, у даліне якой утварыліся аазісы Навайскі, Бухарскі, Каракульскі і інш. На зах. мяжы цячэ Амудар'я. Шмат салёных азёраў. У раёнах арашэння культурна-паліўныя шэразёмы, на астатняй тэр. пясчаныя і супясчаныя шэразёмы, шэра-бурыя глебы, саланчакі і такыры. У аазісах багатая культурная расліннасць, у пустыні хмызнякі (джузгун, астрагал), пясчаная асака, саксаул. У пойме Амудар'і тугайная расліннасць.

Асн. насельніцтва узбекі. Жывуць рускія, украінцы, таджыкі, казахі, татары, туркмены, каракалпакі, яўрэі, армяне, карэйцы. Сярэдняя шчыльн. 6,5 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 31%. Гарады: Бухара, Каган, Наваі.

Асн. галіны гаспадаркі бавоўнаводства, каракулеводства і шаўкаводства. Прамысловасць горназдабываючая, энергетычная, хім., буд. м., лёгкая, харчовая. Б. в. дае 91% здабычы прыроднага газу, 19,5 нафты, 9,1 бавоўны, 9,3 шаўковых коканаў, 35,5% каракуль-

скіх авечак Узб. ССР. У 1967 здабыта 24,3 млрд. $м^3$ прыроднага газу і 343 тыс. *т* нафты. Газаправоды Газлі — Урал, Газлі — Цэнтр, Джаркак — Бухара — Самарканд — Ташкент. Бавоўнаачышчальныя з-ды (Бухара, Каган, Наваі, Гіждуван, Каракуль), з-д апрацоўкі каракулевых шкурак (Бухара), камбінат для вырабу алею з бавоўніку (Гіждуван), грэнажныя з-ды (Бухара, Наваі), вінаробчы з-д і мясакамбінат (Бухара), швейныя ф-кі. У Бухары з-д для рамонту буравога геал. абсталявання. Хім. камбінат і ДРЭС у Наваі. У 1968 выпрацавана эл. энергіі 2,4 млрд. *квт·гадз*. Недалёка ад Кагана вытворчасць алебастру. Прадпрыемствы буд. м. Мастацкія саматужныя промыслы: чаканка па медзі, шоўкаткацкі, вышыванне золатам.

У вобласці 115 калгасаў і 26 саўгасаў (1970). Земляробства на арашоных землях у даліне Зераўшана. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) — 217,4; пад бавоўнікам 159,6, пад збожжавымі 18,5, у т. л. пшаніцы 13,6, ячменю 3. Садоў (тыс. *га*) 6,9, вінаграднікаў 4,3, бахча-ва-агародных культур 5,9. Жывёлагадоўля каракульводчага кірунку (спецыялізуецца 18 гаспадарак; 1,96 млн. гал., 1969). Гадуюць буйн. раг. жывёлу (249,6 тыс. галоў) у раёнах арашэння — малочнага кірунку, у стэпава-паўпустынных — мясного. Даўж. чыгунак 280 *км*. Праз Б. в. праходзіць чыг. Ташкент — Краснаводск і Бухара — Каган — Душанбе. У пустыні аўтамаб. і авіяц. транспарт. Пед. ін-т, агульнатэхн. ф-т Ташкенцкага політэхн. ін-та, 9 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 2 тэатры (Бухара, Гіждуван). Краязнаўчы музей. Абл. газеты: «Бухоро хагигати» («Бухарская праўда») і «Советская Бухара».

М. Р. Цапенка. Ташкент.

БУХАРЭСТ (Bucureşti), сталіца Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі. Размешчаны на Пд краіны на Ніжнедунайскай нізіне, на невялікай р. Дымбавіцы; ахоплены радыяльна-кальцавой сеткай асн. магістраляў. Вялікі вузел чыгунак і шашэйных дарог. Міжнар. аэрапорт. 1390 тыс. ж. (1967).

Першыя звесткі пра Б. адносяцца да 14 ст. З 1659 сталіца Валахіі, з 1861 — Румыніі. З канца 19 ст. важны цэнтр рэвалюц. рабочага руху (вялікія забастоўкі і дэманстрацыі ў 1918, 1921, 1933). У чэрв. 1941 у горад уведзены нямец.-фаш. войскі. 23.8.1944 працоўныя Румыніі пад кіраўніцтвам камуніст. партыі паднялі паўстанне і ва ўмовах рашучага наступлення сав. войск на рум. тэрыторыі скінулі фаш. рэжым І. Антанеску, вызвалілі горад ад акупантаў. 30.12.1947 у Б. абвешчана Румынская Народная Рэспубліка (з 1965 Сацыялістычная Рэспубліка Румынія).

Б. — гал. індустрыяльны цэнтр краіны; на долю яго прыпадае каля 20% валавой прадукцыі прамысловасці Румыніі. Развіты станка- і машынабудаўнічая, эл.-тэхн., паліграф., харч., мэблевая, хім., фармацэўтычная прамысловасць. Вял. з-ды: станкабудаўнічы «Букурэшць», аварных трубаў, аўтобусаў і тралейбусаў «Артабузул», с.-г. машын, «Электроніка», «Аўтаматыка», эл. машын, радыёдэталяў і паўправаднікоў, газасветлавых лямпаў, пластмас. Паліграф. камбінат. ЦЭС.


У Б. збераглісяўзоры старой архітэктуры: цэрквы Міхая Воды (1594), Курця Веке (сярэдзіна 16 ст.) і Стаўраполіс (1724—30), комплекс Патрыярхіі (17—18 ст.); каля Б.— палацавы ансамбль Магашаая (1700—02). Пераважае забудова 19—20 ст., многа маляўнічых паркаў (Чысміджыу, Свабоды), скульптурных помнікаў і манументаў. Пасля ўстанаўлення нар.-дэмакр. улады створаны добраўпарадкаваныя жылыя раёны (Ферэнтар, Балта Албэ, Друмул Таберэй), горадабудаўнічы комплексы (вул. Каля Грывіцэй), арх. ансамбль: Дом «Скынтэі» (1948—53, Х. Майку, Н. Бэдэску, М. Аліфанці), Палац Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі (1959—60, Майку, І. Шэрбан, Т. Рычы), Дзярж. цырк (1961, Н. Парумбеску і інш.), у Б. Румынская АН, шэраг НДІ, ун-т (з 1864), політэхн., будаўнічы, архітэктурны ін-ты, ін-т нафты, газаў і геалогіі і інш. Нац. т-р імя Караджале, Дзярж. т-р оперы і балета, Дзярж. т-р аперэты і інш. Музей Маркса — Энгельса — Леніна. Мастацкі, археалагічны, ваенны, гісторыі Бухарэста і інш. музеі.

БУХВІЦ (Buchwitz) Ота (27.4.1879—9.7.1964), дзеяч нямецкага рабочага руху. Чл. с.-д. партыі Германіі (СДПГ) з 1898. З 1907 прафс. актывіст. У 1919—33 сакратар акр. арганізацыі СДПГ у Ніжняй Саксоніі, у 1924—33 дэпутат рэйхстага. З 1933 у эміграцыі. У 1940 арыштаваны ў Даніі і засуджаны на 8 гадоў катаргі. Вызвалены Сав. Арміяй. У 1945 удзельнік аднаўлення СДПГ. З 1946 чл. ЦК Сацыяліст. адзінай партыі Германіі; з 1949 дэпутат Нар. палаты ГДР, Герой працы (1954). Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1958.



Тв.: Рус. пер. — 50 лет функционером германского рабочего движения, М., 1959.

БУХВОСТАЎ Якаў Рыгоравіч (г. п. і см. невяд.), рускі архітэктар 2-й пал. 17 — пач. 18 ст. З прыгонных сялян сяла Нікольскага-Свярчкова Маскоўскай губ. Мураваныя пабудовы Б. з белакаменнымі дэталямі вызначаюцца стройнасцю, цэльнасцю кампазіцыі і належаць да найлепшых узораў маскоўскага дойлідства канца 17 ст.: сцены з шатровымі вежамі (1690—94) і надваротная царква (1694—97) Нова-Іерусалімскага манастыра ў Істры (пашкоджаны нямец.-фаш. захопнікамі ў 1941); Успенскі сабор у Разані (1693—99, пяцікупальны на падклецці, з трыма радамі вялікіх вокнаў); цэнтрычная яруснаяцаркваў падмаскоўным сяле Уборы (1694—97).



Бухарэст. Праспект Першага мая.

Літ.: Ильин М. А. Зодчий Яков Бухвостов, М., 1956.

БУХГАЛТАРСКІ БАЛАНС, сістэма паказчыкаў, якія характарызуюць стан гаспадарчых сродкаў у пераліку на грошы па пэўную дату. Складаецца з 2 частак: актыву, які паказвае велічыню, склад і размяшчэнне сродкаў, і пасіву, дзе паказаны крыніцы гэтых сродкаў. У падрахунку актыў і пасіў роўныя паміж сабою, бо паказваюць суму адных і тых жа сродкаў. У СССР для ўсіх прадпр. і ўстаноў існуе адзіная форма Б. б. і сістэма паказчыкаў.

На прамысл. і с.-г. прадпрыемствах форма Б. б. прадугледжвае наступную групоўку артыкулаў. Раздзел «А» актыву адлюстроўвае асн. фонды прадпрыемстваў (будынкаў, прамысл. і с.-г. тэхнікі, рабочай і прадукцыйнай жывёлы, шматгадовых насаджэнняў і г. д.) і сродкі, якія выбылі з гасп. абароту прадпрыемства: плата за фонды, рэнтныя плацяжы, узносы ў бюджэт, адлічэнні ў фонды развіцця вытворчасці, матэрыяльнага стымулявання, сац.-культ. мерапрыемстваў і жыллёвага буд-ва і страты. Пасіў адлюстроўвае крыніцы ўласных сродкаў агульнага прызначэння прадпрыемства: статутны фонд, бюджэтнае фінансаванне, прыбытак бягучага года. Да ўласных сродкаў прыраўноўваюцца доўгатэрміновыя крэдыты, устойлівыя пасівы ў памерах мінімальнай запаснічанасці рабочым і служачым, на сац. страхаванне, рэзервы будучых плацяжоў і інш. У раздзеле «Б» актыву паказваюцца нармаваныя абаротныя сродкі і іх нарматывы (рэшткі сыравіны, матэрыялаў і купленых паўфабрыкатаў, паліва, тары, с-г. жывёлы, кармоў, насення, незавершанай вытворчасці, расходаў будучых перыядаў і гатовай прадукцыі па іх фактычным сабекошце ці суме расходаў). У пасіве паказваюцца кароткатэрміновыя крэдыты банка пад нармаваныя абаротныя сродкі і крэдыты па абароце матэрыяльных каштоўнасцей. Раздзел «В» актыву паказвае рэшткі грашовых сродкаў у касе, на разліковым рахунку, у разліках за адгружаныя тавары, дэбіторскую запазычанасць, часова свабодныя абаротныя сродкі, а таксама сродкі і затраты на капітальны рамонт. Пасіў паказвае разліковыя крэдыты Дзяржбанка, крэдыторскую запазычанасць, прывыкарыстаныя рэшткі спецфондаў і мэтавага фінансавання, крыніцы сродкаў на капітальны рамонт і г. д. Раздзел «Г» актыву паказвае сродкі і затраты на капітальнае буд-ва, рэшткі буд. матэрыялаў, абсталявання і дэбіторскую запазычанасць; пасіву — крыніцы гэтых сродкаў, запазычанасць падрадчыкам за выкананыя работы і пастаўшчыкам за адпушчаныя матэрыялы. У раздзел «Д» актыву вылучаны затраты на фарміраванне статка жывёлы ў саўгасах, у гэты ж раздзел пасіву — крыніцы яго фінансавання. В. б. буд. арг-цый, гандл. прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў маюць некат. асаблівасці ў структуры і крыніцах утварэння сродкаў, якія выклікаюцца розным характарам іх гасп. дзейнасці і формамі ўласнасці. У Б. б. саўгаса паказваюцца дзярж. сродкі, перададзеныя яму на сталае ці часовае карыстанне. У калгасным балансе сума непадзельнага фонду з'яўляецца ўласнасцю калгаса. За кошт уласных даходаў у калгасах утвараюцца спец. фонды (дапамогі, на культ.-бытавыя патрэбы, прэміі і г. д.), якія адлюстроўваюцца ў пасіве раздзела «В». У адрозненне ад саўгаснага Б. б. ў калгасным не выдзяляюцца ў самастойны раздзел сродкі і крыніцы фарміравання асн. статка жывёлы. Яны паказваюцца разам са сродкамі і крыніцамі капітальных укладанняў і капітальнага рамонту.

Адзінствам ацэнкі артыкулаў балансу дасягаецца дакладнасць паказчыкаў справаздачнасці і фінансавага стану, ствараюцца магчымасці абагульняць і зводзіць балансы па галінах нар. гасп. і эканам. раёнах, а таксама ўмовы для аб'ектыўнага аналізу і ацэнкі вынікаў гасп. дзейнасці прадпр., арг-цый і іх аб'яднанняў.

І. А. Басманаў. Мінск.

БУХГАЛТАРСКІ ЎЛІК, сістэматычнае, заснаванае на дакументах, адлюстраванне сродкаў і гаспадарчых аперацый у грашовай форме. Мэты, змест і арг-цыя Б. ў. абумоўліваюцца грамадскім ладам. Асн. работы па Б. у. выконвае *бухгалтэрыя*.

Мэта сацыяліст. Б. ў. — улік руху сродкаў і кантроль за іх выкарыстаннем у працэсе планавай гасп. дзейнасці прадпр., арг-цый і ўстаноў. Ён ахоплівае ўсю нар. гасп. і арганізоўваецца дзяржавай. Аб'екты Б. ў.: гасп. сродкі (будынкі, машыны, матэрыялы, паліва і інш.) прадпрыемстваў і арг-цый і гасп. працэсы (набыццё матэрыялаў, вытворчасць прадукцыі, яе рэалізацыя і г. д.). Асн. прыёмы: грашовая ацэнка, сістэма рахункаў, спосаб запісу, абагульненне ўліковых запісаў у балансе, справаздачнасць. Бухгалтарскія запісы робяцца на падставе дакументаў, якія адлюстроўваюць гасп. аперацыі ў момант іх выканання. Суцэльная дакументацыя аперацый забяспечвае дакладнасць, абгрунтаванасць уліковых паказчыкаў і сістэматычны кантроль за выкарыстаннем рэсурсаў. Грашовая ацэнка сродкаў ажыццяўляецца з дапамогай прэйскурантаў, расцэнак, *калькуляцый*. Дакументальна аформленыя аперацыі групуюцца і абагульняюцца ў рахунках. Рахунак падзяляецца на *дэбет* і *крэдыт*. Кожная аперацыя адлюстроўваецца двайным запісам — у аднолькавых сумах на дэбеце аднаго і крэдыце другога рахунку. Рахункі падзяляюцца на актыўныя, пасіўныя і аперацыйныя. На актыўных адлюстроўваюць рух гасп. сродкаў, у дэбет запісваюць іх астатак і павелічэнне, а ў крэдыт — памяншэнне. На пасіўных запісваюць крыніцы фарміравання сродкаў: астатак і павелічэнне — у крэдыт, памяншэнне — у дэбет. На аперацыйных рахунках улічваюць найважнейшыя гасп. аперацыі і іх фін. вынікі. Узаемасувязь паміж рахункамі наз. карэспандэнцыяй, а ўказанне рахункаў дэбету і сумы запісу — бухгалтарскай праводкай. Важным сродкам праверкі правільнасці бухгалтарскіх запісаў і кантролю за зберажэннем сацыяліст. уласнасці з'яўляецца *інвентарызацыя*. Праз яе выяўляюцца неаформленыя дакументамі аперацыі, памылкі ў ўліку, лішкі або нястача матэрыяльных і грашовых каштоўнасцей. У розных галінах нар. гасп. існуюць некат. асаблівасці Б. ў. Але асноўнай яго формай з'яўляецца журнальна-ордэрная. Каб атрымаць вынікі пра гасп. дзейнасць, на падставе бягучага ўліку складаюцца *бухгалтарскі баланс* і інш. формы *справаздачнасці*.

Пры капіталізме Б. ў. служыць інтарэсам капіталістаў, яго прадмет — кругазварот індывідуальнага капіталу, працэс утварэння і прысваення прыбавачнай вартасці. Капіталістычны Б. ў. арганізоўваецца ў рамках асобных прадпр. і манаполій у адпаведнасці з патрабаваннямі іх уладальнікаў.

У сацыялістычным грамадстве Б. ў.— частка адзінай сістэмы народна-гаспадарчага ўліку, адзін са спосабаў планавага кіраўніцтва развіццём прадукцыйных сіл.

Літ.: Бухгалтерский учет, под ред. И. А. Басманова, Мн., 1969. *В. І. Гайрылаў.* Мінск.

БУХГАЛТЭРЫЯ (ням. Buchhalter бухгалтар; кніга ўліку, рахункаводства), 1) вядзенне бухгалтарскага ўліку. 2) Частка адм.-кіраўнічага апарату прадпрыемства, установы ці арганізацыі, якая ажыццяўляе *бухгалтарскі ўлік* і робіць справаздачнасць. Структура і штат Б. на розных прадпрыемствах, у арг-цыях і ўстановах залежаць ад характару іх дзейнасці, аб'ёму гасп. аперацый і ступені механізацыі ўліку. На вялікіх прадпрыемствах Б. падзяляецца на групы (сектары) — матэрыяльную, разліковую, агульную і інш.; узначальваецца гал. (старшым) бухгалтарам; у арг-цыях з невялікім аб'ёмам гасп. аперацый — бухгалтарам або рахункаводам.

БУХЕНВАЛЬД (Buchenwald), фашысцкі канцэнтрацыйны лагер. Створаны ў 1937 (паводле некат. звестак у 1934) на гары Этэрсберг непадалёк ад г. Веймар (Германія). Спачатку ў Б. трымалі ням. палітзняволеных, потым і ваеннапалонных розных нацыянальнасцей, прымусова вывезеных у Германію савецкіх людзей і грамадзян інш. краін свету. Паводле няпоўных звестак, праз Б. прайшло 250 тыс. вязняў, з іх 56 тыс. загінула. Многія адпраўлены на катаванні і смерць у інш. лагеры. Б. называлі лагерам павольнай смерці. Тут практыкаваўся нацысцкі прынцып вынішчэння людзей непасільнай працай. 18.8.1944 у Б. фашысты забілі выдатнага дзеяча ням. і міжнар. рабочага руху Э. *Тэльмана*. У крас. 1945 ва ўмовах шырокага наступлення сав. войск на тэр. Германіі зняволеныя на чале з падпольнай ваен.-паліт. арг-цыяй узнялі паўстанне. Яно скончылася перамогай паўстанцаў і ліквідацыяй лагера. У 1958 у былым лагеры адкрыты помнік героям і ахвярам Б.

Літ.: Бухенвальд. Документы и сообщения, пер. с нем., М., 1962; Война за колючей проволокой. Воспоминания бывших узников гитлеровского концентрационного лагеря Бухенвальд, М., 1960; Свиридов Г. П. Ринг за колючей проволокой (Герои Бухенвальда), 6 изд., М., 1968.

БУХОНКА Пётр Мікалаевіч [29.6(12.7). 1906, мяст. Добруш Гомельскага пав. Магілёўскай губ.— 5.2.1944], Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. З 1928



на цэлюлозна-папяровай ф-цы. На фронце з 1941, сапёр. Вызначыўся 26.9. 1943 пры фарсіраванні Дняпра на Украіне. У час пераправы гумавая лодка была пашкоджана. Паранены Б. не разгубіўся, закрыў прабоіны, выратаваў дэсант і даставіў на зах. бераг. Памёр ад ран. На Добрушскім цэлюлозна-папяровым камбінаце «Герой працы» ў гонар Б. ўстаноўлена мемарыяльная дошка, яго імя навечна занесена ў спісы рабочых прадпрыемства.

БУХТУЕЎ Міхаіл Арцёмавіч (23.11.1925, пас. Кара-Хаш Таджыкскага р-на Тувінскай Народнай Рэспублікі — 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. ВЛКСМ. Вызначыўся ў баі за ст. Чорныя Броды каля Бабруйска. Гусеніцамі танка знішчыў 2 варожыя гарматы. Калі танк загарэўся, ахопленай полымем машынай Б. таранiў браняпоезд праціўніка і цаною жыцця вывеў яго са строю.


БУЦЬКО Павел Пятровіч [н. 1(14).2.1901, в. Калядзічы Пружанскага пав. Гродзенскай губ.], рэвалюцыянер-інтэрнацыяналіст. З сялян. У 1924 уступіў у КПЗБ. Удзельнічаў у стварэнні арг-цый КПЗБ і КСМЗБ у Палескім ваяводстве. У 1925—27 за рэвалюц. дзейнасць зняволены ў турму. Хаваючыся ад праследаванняў, уцёк за мяжу. З 1927 да 1937 на падпольнай рабоце ў Кампартыі Кубы. У 1937—38 абараняў Іспанскую рэсп., капітан інтэрнац. брыгады 46-й ударнай камуніст. дывізіі. Вярнуўшыся на Кубу, працаваў у апараце ЦК Кампартыі. З 1949 жыве ў в. Дабучын Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.



М. І. Клімец. Пружаны.

БУЦЭВІЧ Ванда Антонаўна [н. 2(15).5.1909, в. Рудзенск Ігуменскага пав. Мінскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1951). Чл. КПСС з 1953. У 1948—53 звенявая па вырошчванні кок-сагызу калгаса «Маяк сацыялізма» Рудзенскага р-на Мінскай вобл. У 1953—60 брыгадзір паляводчай брыгады, з 1960 жывёлавод саўгаса «Рудзенскі» гэтага раёна. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалём.

БУЧ, старадаўняя рыбалоўная прылада. Лазовымі прутамі аплятралі абручы. Унутраныя, устаўныя конусы мелі вузкі лаз, праз які рыба, трапіўшы ў Б., не магла выйсці. Б. ўжывалі на мелкаводных рэчках і невялікіх азёрах.



БУЧАЦІНА, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., на р. Волка. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Войкава. За 34 *км* на Пд ад Капыля, 147 *км* ад Мінска, 26 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 921 ж., гасп. 297 (1970). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, 2 магазіны. У Айч. вайну Б. часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

БУЧАЦКАЯ СВІТА (ад назвы в. Бучак каля Канева на Украіне), адклады сярэдняга пададдзела эацэнавага аддзела палеагенавай сістэмы. Залягаюць на адкладах канеўскай світы (ніжні эацэн). Перакрываюцца пародамі кіеўскай світы (верхні эацэн). Вылучаны ў 1893 М. А. Сакаловым у сярэднім цячэнні Дняпра. На Беларусі ёсць на ПдУ ў Прыпяцкай упадзіне.

Адклады Б. с. магутнасцю да 30 *м* — светла-шэрыя разназярністыя кварцавыя пяскі з глаўканітам (мелкаводныя марскія ўтварэнні). Узрост вызначаны па комплексе спораў і пылку, які сведчыць, што ў бучацкі час на Беларусі быў цёплы і вільготны субтрапічны клімат.

БУЧМА Амвросій Максімільянавіч [2(14).3. 1891, Львоў — 6.1.1957], украінскі савецкі акцёр, рэжысёр, педагог. Нар. арт. СССР (1944). Праф. (1941). Чл. КПСС з 1942. Адзін са стваральнікаў укр. сав. т-ра. Сцэнічную дзейнасць пачаў у 1905. З 1936 у т-ры імя Франка. Лепшыя ролі: Раман Круча, Макар Дубрава («Банкір», «Макар Дубрава» А. Карнейчука), Каламійцаў («Апошнія» М. Горкага), Пузыр («Гаспадар» І. Карпенкі-Карага), Мікола Задарожны («Украдзенае шчасце» І. Франка).



Выканаў ролю У. І. Леніна («Праўда» Карнейчука, 1937). Мастацтва Б. вызначалася псіхалаг. глыбінёй і самабытнасцю, багаццем інтанацый, выразнасцю рухаў, мімікі. З 1926 здымаўся ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1949. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Літ.: Львов-Анохин Б. Амвросий Максимилианович Бучма, М., 1959.

БУЧЭННЕ, тое самае, што *адварка тканіны*.

БУШ (Bush) Алан Дадлі (н. 22. 12. 1900, Лондан), англійскі кампазітар, дырыжор, піяніст, музыказнавец. Чл. кампартыі Вялікабрытаніі з 1935. Праф. Каралеўскай акадэміі музыкі з 1925. Заснавальнік (1936) і прэзідэнт (з 1941) Рабочай муз. асацыяцыі. З твораў: оперы «Уот Тайлер» (1950) і «Людзі з Блэкмура» (1955), 3 сімфоніі, у т. л. «Нотынгемская» (2-я) і «Байран» (1960), інстр. канцэрты, хоры «Галодны паход», «Песня працы». Аўтар кнігі «Музыка ў Савецкім Саюзе» (1943). Асн. тэмы творчасці Б.— барацьба простых людзей за свае правы, за мір, рабочая салідарнасць. Неаднойчы наведваў СССР.

БУШ (Busch) Эрнст (н. 22. 1. 1900, Кіль), нямецкі спявак (барытон) і драматычны акцёр. Прапагандыст рэвалюц. песні. Удзельнік рабочага руху. У 1933 эмігрыраваў з фаш. Германіі, быў байцом інтэрнац. брыгад у Іспаніі. У 1939—45 вязень фаш. канцлагераў. З 1946 аднавіў акцёрскую і канцэртную дзейнасць. Адзін з вядучых артыстаў «Берлінер ансамбль» і Ням. т-ра, асабліва вызначаецца ў п'есах Б. Брэхта. Чл. Ням. акадэміі мастацтва. Нац. прэміі ГДР 1949 і 1956.

Літ.: Шнеерсон Г. М. Эрнст Буш, 2 изд., М., 1964.

БУШЭ ДЭ ПЕРТ (Boucher de Perthes) Жак (10.9.1788—2.8.1868), французскі археолаг, які адкрыў самую стараж. эпоху ў гісторыі чалавецтва — *палеаліт*. Сабраў вял. калекцыю палеалітычных прылад працы і сцвярджаў, што імі карысталіся людзі, якія былі сучаснікамі маманта і інш. вымерлых жывёл. Думкі Б. дэ П. супярэчылі поглядам тагачасных палеантолагаў. Толькі ў 60-я г. 19 ст. дарвіністы ацанілі адкрыццё Б. дэ П.

БУЭНАС-АЙРЭС (Buenos Aires), сталіца Аргенціны, самы вялікі горад Паўд. Амерыкі. На беразе Ла-Платы. Найб. марскі порт (каля 75% абароту знешняга гандлю краіны), пач. пункт суднаходства па Паране і Уругваі. Ад Б.-А. ідзе 18 чыгунак у розныя часткі краіны. Міжнар. аэрапорт. 8 млн. ж. (з прыгарадамі, 1968). У Б.-А. працуе 50% рабочых краіны, прамысловыя прадпрыемствы даюць амаль палову прамысл. прадукцыі Аргенціны. Алейныя з-ды, мясахаладабойні, сыраварні, мылаварні, млыны. Развіты тэкст., гарбарная, швейная прамысловасць. Буйныя прадпрыемствы сінт. тканін. Ёсць металург., нафтаперапр. і маш.-буд. прадпрыемствы. Муніцыпальны т-р (1958). Акадэмія л-ры, Нацыянальная акадэмія эканам. навук, Нацыянальная акадэмія права і грамадскіх навук, ун-т, звыш 30 музеяў. Нац. б-ка.

Засн. ў 1535 (паводле інш. звестак у 1536) іспанцамі на месцы паселішча інда Карыа. У 1541 іспанцы пад націскам індзейцаў пакінулі горад (перад адыходам спалілі). У 1580 Б.-А. пачаў адбудоўвацца і стаў цэнтрам іспанскай каланізацыі ў басейне Ла-Платы. З 1776 сталіца віцэ-каралеўства Ла-Платы. Вызвалены ў 1810 у выніку нар. паўстання. З 1816 сталіца Злучаных правінцый Рыо-дэ-Ла-Плата, з 1826 — Аргенціны.

Ад 18 ст. зберагліся цэрквы Сан-Ігнасіо, дэль Пілар, ратуша, сабор. Інтэнсіўна забудоўваецца Б.-А. з канца 19 ст.: пракладваюцца Авеніда дэ Майо (1889—92; біржа, нац. банк, дом прэзідэнта, т-р Калон), Авеніда 9 ліпеня (шыр. 140 *м*) і Паўн. дыяганаль (абедзве ў 1930—40). У 1937—41 вакол Б.-А. ствараецца Авеніда Хенераль Пас (30 *км*, шыр. 100 *м*). У цэнтры горада і на набярэжнай Ла-Платы — фешэнебельныя шматпавярховыя дамы і атэлі сучаснай архітэктуры, небаскробы. На ўскраінах горада — трушчобы беднаты. Помнікі: М. Бельграна (1898), Дж. Гарыбальдзі (1904), Х. Калумбу (1916), К. Альвеару (1914—17) і інш.

Літ.: Столицы стран мира, М., 1966.

Буэнас-Айрэс. Вуліца Фларыда.



БУЯКІ, дурніцы, ганабобель (Vaccinium uliginosum), лістападны кусцік сям. бруснічных. Выш. да 1 *м*, галінкі прамастойныя. Лісце цвёрдае, эліптычнае. Кветкі дробныя, белыя або ружовыя ў парасонападобных суквеццях. Плод — сакаўная, салодкая сінявата-чорная ягада з шызым налётам. Расце з багуном у хвойных лясах, тундрах, на балотах Паўн. паўшар'я. Ягады ядомыя, маюць цукры, дубільныя рэчывы, вітамін С. Добры процідымготны сродак.



1 — галінка з кветкамі; *2* — ягады.

Літ.: Шапиро Д. К., Михайловская В. А. и Манцивода Н. И. Дикорастущие плоды и ягоды, Мн., 1969.

БУЯКОВА Вера Васілеўна (н. 4.3.1924, в. Забалоцце Магілёўскага пав. Гомельскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1964. З 1959 звеннявая па вырошчванні лёну і цукр. буракоў у калгасе «Наша перамога» Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл., з жн. 1967 заг. вытв. ўчастка гэтага калгаса.

БУЯНЫ, вёска ў Мазалаўскім с/с Віцебскага р-на, на р. Храпаўлянка. Цэнтр саўгаса «Лосвіда». За 20 *км* па Пн ад Віцебска, 1,5 *км* ад чыг. ст. Лосвіда, на шашы Віцебск — Ленінград. 147 ж., дваroў 54 (1970). Пач. школа, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі.

БХІЛАІ, горад у Індыі, у штаце Мадх'я-Прадэш. Чыг. ст. 205 тыс. ж. (1967). Вял. металург. камбінат, пабудаваны з дапамогай СССР. Працуе на базе мясцовых жалезных і марганцавых рудаў і кам. вугалю. Вытв. сталі, чыгуну, рэек, вуглавога пракату.

«БЫВАЛЫЯ», партызанская спец. група Наркамата дзярж. бяспекі (НКДБ) СССР, якая ў Айч. вайну вяла разведвальна-дыверсійную і баявую дзейнасць на акупаванай тэр. Беларусі. 28.3.1942 група з 21 чал. перайшла лінію фронту каля Віцебска, дзейнічала ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., Смалявіцкім, Барысаўскім і Лагойскім р-нах Мінскай вобл. У жн. 1942 група «Б.» ператорана ў *партызанскую брыгаду «Дзядзькі Колі»*. Байцы групы і брыгады пусцілі пад адхон 132 варожыя эшалоны; знішчылі і пашкодзілі 77 паравозаў, больш за 1000 вагонаў і платформаў, 288 аўтамашын, 9 танкаў, 6 самалётаў; узарвалі і спалілі 8 мастоў, 32 склады, эл. станцыю і інш. У 1942 група здабыла спіс фаш. агентаў, закінутых у тыл Сав. Арміі. У маі 1943 з брыгады вылучана самастойная група *«Артур»*. 1.7.1944 брыгада (1540 байцоў і афіцэраў) злучылася з часцямі Сав. Арміі. Камандзіру групы і брыгады П. Р. *Лапаціну* прысвоена званне Героя Сав. Саюза.

Літ.: Мачульский Р. Вечный огонь, 2 изд., Мн., 1969; Калинин П. З. Партизанская республика, 2 изд., Мн., 1968; Золотарь И. Верный товарищ, у кн.: Люди легенд, в. 1, М., 1965.

І. С. Барысаў, П. І. Емяльянаў. Мінск.

БЫВАЛЬКІ, вёска ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл., каля Дняпра (2 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Ленінскі сцяг». За 18 *км* на ПдЗ ад Лоева, 118 *км* ад Гомеля, 65 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 1025 ж., дваroў 306 (1970). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік-абеліск сав. воінам, якія загінулі пры вызваленні Б. ад ням.-фаш. захопнікаў у 1943. Тут пахаваны Героі Сав. Саюза Ф. А. *Ермакоў* і Б. Е. *Даўлетаў*.

БЫКАВА Надзея Паўлаўна (н. 15.12.1922, в. Цярэшкі Дрысенскага пав. Віцебскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1967. Удзельніца партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. У 1945—49 даярка калгаса імя Кірава Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., у 1949—59 звеннявая па вырошчванні лёну, даярка калгаса «Серп і молат», з 1960 звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе імя Кірава.

БЫКАЎ Аляксей Васілевіч [н. 1(14).10.1915, в. Быкі Яранскага пав. Вяцкай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. Пад моцным артыл. агнём ворага сапёр Б. правёў інж. разведку берагоў, арганізаваў пераправу дэсантнай групы і ўдзельнічаў у баях за плацдарм. Жыве ў Амутнінскім р-не Кіраўскай вобл.

БЫКАЎ Васіль Уладзіміравіч (н. 19.6.1924, в. Бычкі Лепельскай акр.), беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Вучыўся па скульптурным аддз. Віцебскага маст. вуч. Удзельнік Айч. вайны. Пасля вайны служыў у арміі. З 1956 працуе ў газ. «Гродненская правда». Друкавацца пачаў у 1949 (апавяд. «У той дзень», «У першым баі»). Першая кн. «Жураўліны крык» (1960). Айч. вайна — гал. тэма творчасці Б. У большасці твораў даследуе складаны свет думак і пачуццяў сав. воіна («Трэцяя ракета», 1962, літ. прэмія імя Я. Коласа 1964; «Альпійская балада», 1964, і інш.). Выпрабаванне характару трагедыйнымі абставінамі — рыса творчай індывідуальнасці пісьменніка. Веданне псіхалогіі салдата, франтавога побыту — гал. якасці яго лепшых твораў. Пафас іх у сцвярджэнні гераізму. Але некат. Пафас іх у сцвярджэнні гераізму. Але некат. торам Б. характэрныя аднабаковасць у паказе жыцця, эстэтычная і маральная задаволенасць, паўторы ў сюжэтных сітуацыях (аповесці «Мёртвым не баліць», 1965; «Праклятая вышыня», 1968; «Круглянскі мост», 1969). Гумар. і сатыр. апавяданні ў кн. «Ход капём» (1960). Аповесці «Трэцяя ракета» і «Альпійская балада» экранізаваны кінастудыяй «Беларусьфільм» (сцэнарыі аўтара). Бел. т-р оперы і балета па матывах «Альпійскай балады» паставіў аднайменны ба-



лет (муз. Я. Глебава). Творы Б. перакладзены на рус., укр., літ., латыш., эст., тадж., балг., польскую, нямецкую, італьян., араб., яп. і інш. мовы. Узнаг. ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Тв.: Трэцяя ракета. Здрада, Мн., 1962; Альпійская балада, Мн., 1964; Адна ноч, Мн., 1965; Аповесці, Мн., 1969; Тры абзацы аўтабіяграфіі, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Бугаёў Дз. Пачатак шляху, «Маладосць», 1960, № 12; Ягорж. Шматграннасць, Мн., 1970; Буран В. Талент суровы і добры, у кн.: На высокай хвалі, Мн., 1968; Козлов И. Фронтовые страницы (о повестях Василя Быкова), «Знамя», 1965, № 3.

БЫКАЎ Віктар Мікалаевіч (н. 19.2.1945, г. Алма-Ата), засл. майстар спорту СССР. З 1968 студэнт Бел. ін-та фіз. культуры. Чэмпіён СССР 1965—66 па веласіпедным спорце ў індывідуальных спаборніцтвах на трэку (гонка праследавання на 4 *км*); у 1968—69 у камандных гонцы. У 1967 і 1969 чэмпіён свету ў камандных гонцы (Амстэрдам, Брно).

БЫКАЎ Канстанцін Міхайлавіч [8(20).1.1886, г. Чухлама Кастрамской губ.— 13.5.1959], савецкі фізіёлаг. Акад. АН СССР (1946), правадз. чл. АМН СССР (1944), засл. дз. н. РСФСР (1940). Заг. аддзела агульнай фізіялогіі Усесаюзнага ін-та эксперым. медыцыны (1933—50), дырэктар Ін-та фізіялогіі імя Паўлава АН СССР (1950—59). Вучань І. П. Паўлава. Даследаваў утварэнне ўмоўных рэфлексаў ад рэцэптараў унутраных органаў і ўплыў на гэтыя органы кары вялікіх паўшар'яў галаўнога мозгу, фізіялогію стрававання (распрацаваў палажэнне пра сакраторныя залозы страўніка), праблему хім. перадачы ўзбуджэння ў нервовых цэнтрах; стварыў кортыка-вісцэральную тэорыю патагенезу язвавай хваробы. Аўтар твораў па бальнеалогіі і курорталогіі. Дзярж. прэмія СССР 1946. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Избр. произв., т. 1—3, М., 1953—58.

БЫКАЎ Мікалай Міхайлавіч [н. 19.12.1903 (1.1.1904), Адэса], савецкі анатам. Праф. (1965). Скончыў 2-і Ленінградскі мед. ін-т (1930). З 1946 выкладчык кафедры анатоміі Ленінградскага ін-та фіз. культуры імя Лесгафта. З 1962 заг. кафедры анатоміі Смаленскага, з 1966 Бел. ін-та фіз. культуры. Асн. працы па вывучэнні нервовага апарату артэрый, асаблівасцей будовы шкілета ў залежнасці ад лакаматорнай функцыі, узроставых змен апарату руху, біяхім. аналізу функцыі мышцаў у спартсменаў. Узнаг. 6 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Анатомия. Методические указания для учащихся отделений заочного обучения техникумов физической культуры, М., 1963.

БЫКАЎ Міхаіл Сямёнавіч (н. 16.10.1922, г. Жлобін), Герой Сав. Саюза (1946). З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Працаваў слесарам. Скончыў Бабруйскі аэраклуб. У Чырв. Арміі з 1940. На фронце з 1941. Удзельнік баёў на Зах., Бранскім, 1-м і 4-м Укр. франтах. Зрабіў 174 баявыя вылеты. Знішчыў і пашкодзіў 52 варожыя танкі, 200 аўтамашын, 40 гармат, 12 самалётаў, узарваў 12 складаў з боепрыпасамі. Жыве ў Бабруйску.



БЫКІ, парнакапытныя жывёлы з сям. пустарогіх. Гл. *Бізон, Зубр, Тур.*

БЫКОЎСКІ Валерый Фёдаравіч (н. 2.8.1934, г. Паўлаўскі Пасад Маскоўскай вобл.), лётчык-касманаўт СССР. Герой Сав. Саюза (1963), палкоўнік. Чл. КПСС з 1963. У 1955 скончыў Качынскае авіяц. вучылішча, у 1968 — Ваенна-паветр. інж. акадэмію імя Жукоўскага. 14—19.6.1963 ажыццявіў палёт у космас на касм. караблі «Усход-5». За 119 гадзін лёту зрабіў 81 віток вакол Зямлі і праляцеў больш за 3,3 млн. *км*. З 16 чэрвеня палёт Б. праходзіў адначасова з палётам касм. карабля «Усход-6», які пілатавала В. У. *Нікалаева-Церашкова*. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі, замежнымі ордэнамі.



БЫКОЎСКІ Міхаіл Іванавіч (19.4.1919, с. Верхні Мамон Паўлаўскага пав. Варонежскай губ.— 27.1.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС. На фронце з чэрв. 1941. Вызначыўся 1.10.1943 каля Лоева Гомельскай вобл. Батальён, якім камандаваў Б., пад агнём ворага фарсіраваў Дняпро, выбіў праціўніка з пазіцый, замацаваўся на плацдарме, за 3 сутак адбіў 19 варожых контратак. Загінуў у баях за вызваленне Калінкавіч Гомельскай вобл. Пахаваны ў Калінкавічах.

БЫЛІНСКІ Іван Сямёнавіч [н. 15(28).1.1903, в. Якубоўка Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], парт. і дзярж. дзеяч БССР. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Гомельскі лесатэхн. ін-т (1936). Працаваў слесарам паравозавагонарамонтнага з-да (1920—26), сакратаром к-та ЛКСМБ Залінейнага р-на ў Гомелі, сакратаром Бабруйскага акр. к-та ЛКСМБ, нам. дырэктара Белкалгасбудтрэста (1927—31). У 1938—39 кіраўнік Бел. трэста фанернай прамысл., у 1939 інструктар, заг. аддзела лясной прамысл. ЦК КП(б)Б. З сак. 1940 першы сакратар Палескага абкома КП(б)Б, з 28.6.1940 старшыня, з пач. 1944 нам. старшыні СНК БССР, з кастр. 1944 да ліп.



1946 першы сакратар Палескага абкома КП(б)Б. Пазней на адказных дзярж. і адм.-гаспадарчых пасадах. На XVIII—XIX з'ездах КП(б)Б выбраны чл. ЦК, на XX—XXIII — канд. у чл. ЦК, у 1940—46 чл. Бюро ЦК КП(б)Б. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га і 2-га скл., дэп. Вярх. Савета БССР 1-га і 3-га скліканняў. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

БЫЛІНЫ, народныя эпічныя песні, якія ўзніклі ў Старажытнай Русі і адлюстравалі найбольш важныя падзеі яе гісторыі.

Героі Б. — асілкі-волаты Ілья Мурамец, Дабрыня Нікіціч, Алёша Паповіч і інш., што абаранялі Русь ад качэўнікаў. Б. славілі магутнасць Русі, абуджалі пачуцці патрыятызму («Ілья Мурамец і Каліп-цар», «Ілья Мурамец і Салавей-разбойнік», «Дабрыня і Змей», «Алёша Паповіч і Тугарын»). Вобразам асілкаў, нар. заступнікаў, процістаяць князі і баяры, прыгнятальнікі нар. мас. Вядомы і сац.-бытавыя Б. («Вальга і Мікула Селянінавіч»; наўгародскія «Садко», «Васіль Буслаеў»). Захаваліся яны пераважна на Еўрап. Поўначы (раёны Заанежжа, Мязені, Пінегі, Пячоры, узбярэжжа Белага м.).

На Беларусі бытавалі яшчэ ў 16 ст. Ствараліся таксама мясцовыя, бел. разнавіднасці — Б. т. зв. «себежскай групы», у якіх Ілья Мурамец па дарозе ў Кіеў выратоўвае старажытны г. Себеж ад варожага войска. Пра былінную традыцыю на Беларусі ў позняй ступені сведчаць і гістар. песні пра Смаленск (Смаленец). Урыўкі Б. і гістар. песні былінnага складу трапляліся на Беларусі нават у канцы 19 ст. Паасобныя сюжэты ці сляды Б. захаваліся ў казках і абрадавай паэзіі беларусаў.

Літ.: Былины. Подгот. текста, вступ. статья и коммент. В. Я. Проппа и Б. Н. Путилова, т. 1—2, М., 1958; Пропп В. Я. Русский героический эпос, 2 изд., М., 1958; Аникин В. П. Русский богатырский эпос, М., 1964; Астахова А. М. Былины. Итоги и проблемы изучения, М. — Л., 1966; Беларускі эпас, Мн., 1959; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967.

М. Я. Грынблат. Мінск.

БЫЛІЧ Канстанцін Фёдаравіч (1906—24.9.1944), беларускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1935). З 1925 у Другой бел. дзярж. трупе (Бел. трэці дзярж. драм. т-р), з 1937 у БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы). Выконваў ролі гераічнага плана і характарныя: Андрэй («Плытагоны» У. Галубка), Кастусь Каліноўскі (аднайм. п'еса Е. Міровіча), Савіцкі («Контратака» Дз. Курдзіна), Шматалюк («Дзяўчаты нашай краіны» І. Мікітэнкі), Карфункель («Гадзіншчык і курыца» І. Качаргі), сяржант Дроб (аднайм. п'еса Э. Самуйлёнка), Фердынанд («Каварства і каханне» Ф. Шылера), Яндрыхоўскі («Партызаны» К. Крапівы).

Літ.: Атрошчанка А. Талент адметны, яркі, «Маладосць», 1968, № 12.

БЫЛІЧКІ, кароткія вусныя апавяданні пра незвычайныя здарэнні, якія нібыта адбываліся ў жыцці. Гэтая ўлюбная верагоднасць падзей адрозніваe іх ад казак. Былі пашыраны на Беларусі. Звычайна апавядаюць пра сустрэчы з чарцямі, дамавікамі, мерцвякамі і г. д. Са знікненнем веры ў надпрыродныя сілы яны адміраюць, часам даюць пачатак гумарыст. апавяданням.

Літ.: Чистов К. В. К вопросу о принципах классификации жанров устной народной прозы, М., 1964; Federowski M. Lud białoruski na Rusi litewskiej, t. 1—3, Kraków, 1897—1903.

БЫРАНГА ГОРЫ, у цэнтр. частцы п-ва Таймыр. Цягнуцца ад бас. р. Пясіна на У да ўзбярэжжа м. Лапцевых на 750 *км*. Шыр. 150 *км*. Найбольшая выш. 1146 *м*. Б. г.— сістэма хрыбтоў і платопадобных масіваў. Складзены пераважна з пясчанікаў, трапавых базальтаў і дыябазаў. На У Б. г. ледавікі, пл. абледзянення 50 *км*². Схілы ўкрыты лішайнікамі.

БЫСТРАМАЎЦЫ, вёска ў Плюскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на паўн. беразе воз. Малая Ельня. Цэнтр калгаса «Прагрэс». За 20 *км* на Пн ад Браслава, 215 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Друя, 18 *км* ад чыг. ст. Краслава (Латв. ССР). 127 ж., двароў 49 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БЫСТРАНКА (Alburnoides bipunctatus), рыба сям. карпавых. Даўж. да 14 *см*, маса да 13 *г*. Спіна цёмна-шэрая або цёмна-зялёная, брушка серабрыстае. Луска тонкая, лёгка ападае. Вядома некалькі падвідаў: Б. руская, Б. паўднёвая, Б. паласатая. На Беларусі тыповая Б. водзіцца ў бас. Зах. Дзвіны, Нёмана, Зах. Буга, а падвід Б. руская — у бас. Дняпра. Палавай спеласці Б. дасягае ў 2 гады. Нерастуе ў маі — чэрвені. Ікру адкладае порцыямі на быстрынях з камяністым дном.



БЫСТРАЯ, рака, левы прыток Проні (бас. Сажа). Даўж. 46 *км*. Пачынаецца на ПдЗ Смаленскага ўзв., цячэ па Аршанска-Магілёўскай раўніне ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл. Вадазбор (688 *км*²) — плато-падобная раўніна, складзеная з лёсападобных, водналедавіковых і марэнных адкладаў. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 4,5 *м*³/*сек*.

БЫСТРЫЦА, вёска ў Трокеніцкім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл., на р. Вілія. За 30 *км* на Пн ад Астраўца, 280 *км* ад Гродна, 35 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 295 ж., гасп. 91 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання, васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У грамадз. вайну каля Б. дзейнічалі палкі Г. Дз. Гая. 13.7.1920 пры вызваленні Б. загінуў камісар 4-й брыгады 10-й кав. дывізіі паплечнік Гая — Т. Я. Яўсееў. Школа і калгас названы яго імем. Помнік Т. Я. Яўсееву.

БЫСТРЫЦА, вёска ў Блеўчыцкім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Ціміразева. За 14 *км* на ПдЗ ад г. п. Капыль, 138 *км* ад Мінска, 11 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 438 ж., двароў 158 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, 2 магазіны. Радзіма

І. Дз. *Варвашэні* і ген.-л. В. Р. *Гулейкі*. Музей баявой і працоўнай славы.

БЫТ, умовы і ўклад штодзённага існавання, сукупнасць спосабаў і формаў непасрэднага задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб людзей у невытворчай сферы. З Б. звязана задавальненне патрэб у харчах, адзенні, жыллі, выхаванне дзяцей, падтрыманне здароўя, адпачынак і забавы. Элементы Б.— звычаі, абрады, прывычкі і нормы індывідуальнага жыцця, шлюбна-сямейныя адносіны, у якіх выяўляецца ўклад жыцця класаў і інш. сац. груп.

Б. цесна звязаны з базісам і надбудовай грамадства, пастаянна развіваецца. Бытавыя ўмовы існавання людзей у класавых фармацыях вызначаюцца месцам класаў, якое яны займаюць у сістэме грамадскай вытворчасці. Супярэчнасць паміж горадам і вёскай абумоўлівае розны Б. гарадскога і сельскага насельніцтва, яна знікае толькі ў працэсе камуніст. буд-ва. На Б. людзей робяць уплыў рэлігія, яе абрады і нац. асаблівасці розных народаў. Пры сацыялізме ён абумоўлены грамадскай уласнасцю на сродкі вытворчасці і непасрэдна залежыць ад узроўню матэрыяльнага і духоўнага развіцця гр-ва. На ўзнікненне і развіццё новых формаў Б. ў СССР уплываюць планамернае скарачэнне рабочага дня, дзярж. забеспячэнне ў старасці, клопаты дзяржавы пра жыллё насельніцтва, пра забеспячэнне дзяцей яслямі і садамі, бясплатная адукацыя і мед. дапамога, арганізацыя фіз. выхавання, адпачынку, развіццё маст. самадзейнасці. Тэндэнцыі змены Б. найб. яскрава выяўляюцца ў *сям'і*, якая выконвае перш-наперш культурна-выхаваўчую функцыю і адпачасова з'яўляецца гал. формай арг-цыі асабістага Б.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; Харчев А. Г. Брак и семья в СССР, М., 1964; Строительство коммунизма и социальные изменения в крестьянстве Белоруссии, Мн., 1966, с. 126—147; Социальные изменения рабочего класса Белоруссии в процессе строительства коммунизма, Мн., 1965, с. 117—162.

Р. В. Надольскі. Мінск.

БЫТАВОЕ АБСЛУГОЎВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА, грамадска арганізаваныя формы і спосабы задавальнення розных матэрыяльных і культурных патрэб людзей праз паслугі на заказах.

Адрозніваюць прамысл. і непрамысл. быт. паслугі. Прамысл.: рамонт легкавых аўтамашын, выраб і папраўка быт. і гасп. прадметаў — адзення, абутку, мэблі, быт. машын і прылад, чыстка і фарбаванне адзення і інш. заказы, якія выконваюцца майстэрнямі, атэльe, пральнямі, камбінатамі быт. абслугоўвання і спецыялізаванымі ф-камі. Непрамысл. паслугі: работа лазняў, цырульняў, фотаатэльe, пракатных пунктаў, бюро даведак, а таксама бюро паслуг (рамонт і прыбіранне кватэр, догляд дзяцей і хворых, дастаўка дадому білетаў на транспарт, у тэатры, кіно і г. д.). У дарэвалюц. Беларусі асобныя быт. паслугі насельніцтву рабілі саматужнікі-адзіночкі. У першыя гады Сав. улады яны аб'ядноўваліся ў арцелі, ствараліся таксама каап. і дзярж. майстэрні. Да Айч. вайны ў БССР налічвалася каля 1500 прадпр. быт. абслугоўвання, у вайну яны былі разбураны. У 1959 іх было ў 2,5 раза больш, чым у 1940. У 1965 працавала больш за 6 тыс. ф-к, атэльe, майстэрняў, прыёмачных пунктаў, у т. л. 2 буйныя аб'яднанні: «Прагрэс» у Мінску і «Світанне» ў Віцебску. Агульны аб'ём выкананых за год паслуг перавысіў 64 млн. руб. Адначасова з развіццём быт. абслугоўвання гарадскога насельніцтва павялічваецца колькасць прадпрыемстваў быту ў сельскай мясцовасці.

Для кіравання сеткай быт. прадпр. і планавання яе развіцця створана Мін-ва быт. абслугоўвання нас. БССР (1966). У абласцях і ў Мінску Б. а. п. кіруюць упраўленні быт. абслугоўвання пры выканкомах абласных і Мінскім гарадскім Саветах дэпутатаў працоўных, Рэсп. дырэкцыя прыёмнай радыётэлевізійнай сеткі, гал. ўпраўленне Белаўтатэхабслугоўванне. У раённых цэнтрах створаны камбінаты быт. абслугоўвання, у рабочых пасёлках і вялікіх вёсках — камбінаты і павільёны бытавых паслуг (пашыўка і направа адзення, абутку, цырульня, фатаграфія, прыёмачны пункт). У невялікіх аддаленых вёсках адкрыты прыёмачныя пункты, дзе ў насельніцтва прымаюцца заказы на розныя віды быт. паслуг. У БССР на 1.1.1970 было 8657 прадпр. Б. а. п., з іх 4118 у сельскай мясцовасці, якія рабілі сялянам больш за 300 відаў быт. паслуг — ад пашыўкі і направы абутку і адзення да рамонту дамоў. За 1969 у параўнанні з 1968 аб'ём быт. паслуг у рэспубліцы павялічыўся на 23,9%, у т. л. ў сельскай мясцовасці на 51,6%. Асабліва вырастае аб'ём такіх паслуг, як фарбаванне адзення, рамонт дамоў, а таксама тэлевізараў, халадзільнікаў, пральных машын і інш. электрапрылад доўгага карыстання. У 1967 для забеспячэння развіцця Б. а. п. створаны Беларускі праектна-тэхналагічны інстытут. З 1969 у рэспубліцы выдаецца вытворча-масавы бюлетэнь «Служба быту Беларусі» — орган Мін-ва быт. абслугоўвання насельніцтва БССР. У СССР звыш 200 тыс. прадпр. быту, якія зрабілі насельніцтву паслуг больш чым на 3 млрд. руб. (1968).

Літ.: Розе М. Г. и Россинский М. Б. Планирование и экономика бытового обслуживания населения, 2 изд., М., 1968; Услуги и их социально-экономическая роль, М., 1967; Вопросы экономики службы быта, М., 1966.

П. І. Папоў. Мінск.

БЫТАВЫ ЖАНР (недакладна «жанравае мастацтва», «жанравы жывапіс»), галіна выяўленчага мастацтва, звязаная з сучасным для мастака штодзённым асабістым і грамадскім жыццём. Атрымаў развіццё пераважна ў станковым жывапісе; сустракаецца ў графіцы і скульптуры.

Б. ж. — адна з праяў дэмакр. тэндэнцый мастацтва. Бытавыя сцэны вядомы ў стараж. і сярэдневяковым мастацтве (мініяцюра «Вясельнае ігрышча» ў «Радзівілаўскім летапісе» 13 ст.). Як асобны жанр пашырэецца ў эпоху Адраджэння, асабліва ў Нідэрландах (П. Брэйгель Старэйшы Мужыцкі). У 17 ст. канчаткова фарміруюцца асаблівасці Б. ж.: цікавасць да штодзённага жыцця, увага да дэталяў быту, псіхалагічных нюансаў (П. дэ Хох, А. ван Астадэ, Ян Стэн, Г. Тэрбарх, Ян Вермер Дэлфцкі, М. Караваджа, Д. Веласкес, Рэмбрант, Ф. Халс, А. Браўэр, П. П. Рубенс, Я. Іорданс, Ж. дэ Латур, браты Ленен). У 18 ст. развіццё Б. ж. звязана з рэаліст. творамі А. Ватo; трэцяму саслоўю прысвечаны праслякнутыя сувэральнасцю палотны Ж. Б. Шардэна і сентыментальна-маралісцкія карціны Ж. Б. Гроза (Францыя), сатырычныя У. Хогарта (Англія). У 19 ст. салоннаму мастацтву процістаіць В. ж., які паказвае малюнкі жыцця працоўнага народа (Ф. Гоя ў Іспаніі, А. Дам'е, Ф. Міле, Г. Курбэ, Э. Дэга, В. ван Гог у Францыі, І. Манес, К. Пуркіне ў Чэхаславакіі, М. Мункачы ў Венгрыі, І. Ангелаў у Балгарыі, Т. Аман у Румыніі, А. і М. Герымскія ў Польшчы). У цэнтры ўвагі сучаснага прагрэс. мастацтва — новы вобраз чалавека працы (Ф. Мазераль, Р. Гутуза і інш.). Рускі Б. ж. цесна звязаны з нац.-дэмакр. культурай (А. Венецыянаў, П. Фядотаў, В. Пяроў, І. Прянішнікаў). Перасоўнікі ўсебакова выявілі сац. сутнасць жыцця царскай Расіі (І. Рэпін, К. Савіцкі, У. Макоўскі, М. Ярашэнка). Развіццё савецкага Б. ж.

звязана з творчасцю А. Архіпава, М. Касаткіна, Б. Кустодзіева, К. Пятрова-Водкіна і інш. У адпаведнасці з асн. патрабаваннем сацыялісг. рэалізму сав. Б. ж. адлюстроўвае і сцвярджае станоўчае, прагрэсіўнае і крытыкуе асобныя адмоўныя з'явы ў грамадскім і асабістым жыцці (А. Дайнека, Б. Іагансон, А. Маравaў, Б. Неменскі, Ю. Піменаў, А. Пластаў, А. і С. Ткачовы, Я. Чапцоў, С. Чуйкоў, Т. Яблонская і інш.). В. ж. трактуецца ў плане гераічным, набываючы манумент. рысы (В. Пашкоў, Т. Салахаў, А. і П. Смоліны, Э. Эльтнер), лірыка-эпічным (А. Зардаран, І. Клычаў, А. Лявіцін), пазтычным, звязаным з тэмай гарманічнай сувязі чалавека і прыроды. Характэрныя рысы сучаснага В. ж.: паглыбленасць інтэлектуальнага зместу вобразаў, адмаўленне ад ілюстрацыйнасці, раскрыццё чалавека ва ўсёй сукупнасці яго жыццёвых праяў.

У бел. мастацтве ўзнікненне Б. ж. назіраецца ў быт. трактоўцы шэрагу абразоў: «Нараджэнне Багародзіцы» Пятра Яўсеевіча з Галыніч, 1649; «Пакланенне вешчуноў», 17 ст. Сфарміраваўшыся ў 18 ст. (гравюры М. Жукоўскага ў кнізе У. Радзівіл «Трагедыі і камедыі...», 1754) і 1-й пал. 19 ст. (Ян Дамель і інш.), Б. ж. асабліва пашырыўся з 2-й пал. 19 ст. Нац. тыпаж, бытавыя сцэны ўласцівы творам А. Бартэльса, А. Гараўскага, Н. Сіліванoвіча і інш. У канцы 19 — пач. 20 ст. Б. ж. развіваецца ў акварэлях Э. Сукоўскага, якія адлюстроўвалі жыццё беднаты, К. Альхімовіча, С. Богуша-Сестранцэвіча і жывапісе Ю. Пэна, які стварыў серыю карцін на сюжэты з яўр. быту. У мастацтве Сав. Беларусі Б. ж. набыў рысы, абумоўленыя характарам сав. рэчаіснасці. Сацыяліст. пераўтварэнні ў горадзе і вёсцы, новы быт адлюстраваны ў творах І. Ахрэмчыка, В. Волкава, М. Манасзона, А. Шаўчэнкі і інш. У час вайны ваенным будням сав. воінаў і партызанаў прысвячаюць свае работы М. Беляніцкі, І. Давідовіч, С. Раманаў, У. Сухаверхаў і інш. Пасляваенныя гады характэрны новымі дасягненнямі Б. ж. (жывапісцы А. Бархаткоў, Н. Воранаў, В. Грамыка, А. Гугель, М. Данцыг, Ф. Дарашэвіч, В. Жолтак, К. Касмачоў, П. Крохалеў, Р. Кудрэвіч, Х. Ліўшыц, А. Мавалёў, А. Малішэўскі, Я. Радзялоўская, Л. Ран, В. Савіцкі, М. Савіцкі, І. Стасевіч, У. Стальмашонак, В. Сумараў, М. Філіповіч, Я. Ціхановіч, Л. Шчэмелеў, А. Шыбнёў, графікі С. Герус, Б. Забораў, А. Кашкурэвіч, скульптары А. Глебаў і інш.). Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Русская жанровая живопись XIX — начала XX в., М., 1964; Маслені кaў П. В. Беларускі савецкі тэматычны жывапіс, Мн., 1962; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960. *А. І. Каплун.* Масква; *А. К. Рэсіна.* Мінск.

БЫХАЎ, горад, цэнтр Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Прыстань на Дняпры, чыг. ст. на лініі Ленінград — Адэса. За 51 км па Пд ад Магілёва. 15,3 тыс. ж. (1969).

Вядомы як горад пад назвай Стары Быхаў з 14 ст. У актах 1430 упамінаецца як уладанне князя Вял. кн. Літ. Свідрыгайлы. У 1556 падараваны кіеўскаму ваяводу Рыгору Хадкевічу, у 1628 перайшоў да Сапегаў. У лют. 1590 казацкі атрад Мацюшы займаў Б. У 1610 гетман Вял. кн. Літ. Кароль Хадкевіч умацаваў Б., які в таго часу лічыўся адной з лепшых ваен. крапасцей Беларусі. У вызваленчую вайну ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54 Б. нейкі час трымалі ў асадзе казацкія войскі *Ф. Гаркушы* (1648), у руска-польскую вайну 1654—67 — І. Залатарэнкі (1655), які тут і загінуў. У Паўночную вайну 1700—21 важны стратэгічны пункт. Гераічная абарона Б. ў 1708 невялікім рус. гарнізонам і мясцовымі жыхарамі не дала магчымасці стаўленіку шведаў Сапегу авалодаць горадам і памагчы войскам Левенгаўпта, якія былі разбіты рускімі каля в. Лясная. У 1772 в усх. частках Беларусі далучаны да Расіі. Павятовы цэнтр Магілёўскай губ. (1773—76 і з 1802). Паводле перапісу 1897 у Б. 816 дамоў, 6381 ж., з якіх 36,2% пісьменных; у 1913 — 8100 ж. На саматужных прадпрыемствах Б. (ветраці, крупадзёркі і інш.) працавала каля 60 рабочых (1904); было гарадское вуч. Напярэдадні і ў час Вял. Кастр. рэв. тут былі аяяволены царскія генералы, т. зв. «быхаўскія вязні» — Л. Г. Карнілаў, А. І. Дзянікін, А. С. Лукомскі, І. П. Раманоўскі, Маркаў і інш., якія ўдзельнічалі ў карнілаўскім мяцяжы. У ноч на 20.11.1917 яны ўцяклі разам з аховай. Сав. ўлада ўстаноўлена ў канцы ліст. 1917. У Вял. Айч. вайну Б. разбураны. Помнік піянеру-партызану Марату Казлову.

Найб. прадпрыемства *Быхаўскі кансерва-ва-агароднінасушыльны камбінат* (каля 25% усіх агародніннх кансерваў рэспублікі). Хлебазавод, з-д сухога абястлушчанага малака і цэх металічных вырабаў, мэблевая ф-ка, камбінат быт. абслугоўвання, міжраённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Будуецца (1970) лёназавод. 3 сярэднія, 2 васьмігадовыя, школа рабочай моладзі, муз. і спарт. школы, 8 дашкольных устаноў; Дом культуры, Дом піянераў, кінатэатр, 3 б-кі, бальніца, дыспансер.

Першыя крапасныя збудаванні ў Б. адносяцца да 14 ст. У 1610 горад быў акружаны сістэмай умацаванняў. Вакол старой часткі (каля 0,25 км²), якая стала першапачатковым цэнтрам Б., групаваліся жылыя кварталы. З 1778 у планіроўцы горада спалучаюцца радыяльная і рэгулярная сістэмы вуліц. Сучасны цэнтр (вул. Леніна) з адміністрацыйнымі, культ.-бытавымі, гандлёвымі і жылымі дамамі, уключае арх. помнікі 16—17 ст. (гл. *Быхаўскі замак, Быхаўская сінагога*) і стадыён з невялікім скверам. Генплан прадугледжвае рост горада на Пн, набліжэнне цэнтра да Дняпра і добраўпарадкаванне зоны адпачынку ўздоўж ракі.

Літ.: Опыт описания Могилевской губернии, под ред. А. С. Дембовецкого, кн. 1—2, Могилев, 1882—1884; Россия. Полное географическое описание нашего отечества, под ред. В. П. Семенова, т. 9, СПб., 1905; Богданович А. В. и Сидоров П. А. Города Белоруссии, Мн., 1967; Зельтен Н. А. Архитектура и планировка малых городов Белоруссии, Мн., 1968, с. 102—103.

А. С. Акінчыц, У. А. Чантурыя. Мінск.

БЫХАЎСКАЯ СІНАГОГА, помнік архітэктуры барока. Пабудавана ў пач. 17 ст. ў *Быхаве*. Цэнтрычная пабудова, падобная да крапасных збудаванняў [у плане прамавугольнік — (*м*) 20×21, таўшчыня сцен 1,75 *м*]. Мае круглую вуглавую вежу, якая выступае за межы пабудовы. Вокны размешчаны высока. У атыкавым ярусе — прамавугольны



Быхаў. Універмаг на вуліцы Леніна.



Бытавы жанр I. 1. П. Брэйгель. Фламандскія прыказкі. Фрагмент. 1559. 2. Ян Вермер. Дзяўчына чытае пісьмо. 50-я г. 17 ст. 3. Ф. Гоя. Пахаванне сардзіны. 1793. 4. А. Г. Венецыянаў. Гумно. 1822—23. 5. П. А. Фядотаў. Пераборлівая нявеста. 1847. 6. П. Н. Гаўрыленка. Ідзе эшалон. 1957. 7. А. А. Пластаў. Вясна. 1954.



1


Бытавы жанр II. 1. В. В. Волкаў. Студэнты. 1947. 2. Р. У. Кудрэвіч. Беларускія прыпеўкі. 1960. 3. М. А. Савіцкі. Хлеб. 1962. Усе ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.



2



3



Быхаўская сінагога. Від з паўднёвага ўсходу (злева) і план.

ныя і круглыя байніцы (пазней замураваныя). У цэнтры квадратнай залы — шматярусная трыбуна (4 каменныя слупы, злучаныя аркамі па вышыні). Знадворны дэкор стрыманы.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 500.

БЫХАЎСКІ ЗАМАК, палацава-замкавы ансамбль барока. Пабудаваны ў *Быхаве* ў пач. 17 ст., часткова перабудоўваўся ў 2-й пал. 17—18 ст. Належаў кн. Сапегам. Абнесены земляными валамі, аддзелены ад горада ровам з вадою. Каліські быў цэнтрам сістэмы ўмацаванняў Быхава. У комплекс будынкаў замка, размешчаны па перыметры няправільнага чатырохвугольніка, уваходзілі гал. корпус (палацавы будынак) і казармы з шасцігранными вежамі. Паўн. частка ўнутранага двара мела крапасную сцяну. У гал. корпусе, арыентаваным на Дняпро,— парадныя залы і пакоі, уваход у якія ішоў праз аркадную галерэю. Сумежныя з асн. залай 2-га паверха (левая частка корпуса) былі анфілада памяшканняў і жылыя пакоі замка. Палацава-замкавы ансамбль абярогся часткова.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 479—480.


БЫХАЎСКІ КАНСЕРВАВА-АГАРОДНІНА-СУШЫЛЬНЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства харч. прамысловасці. Самае вялікае ў БССР сярод прадпр. гэтага тыпу. Выпускае больш за 70 відаў прадукцыі: кансерваваныя кабачковую ікру, зялёны гарошак, таматы, гуркі, грыбы, розныя віды соку, павідла, джэму, варэння, крэкеры з бульбы і інш. Пабудаваны пасля Айч. вайны. Гал. цэхі: кансервавы, сушыльны, меланжавы. У 1969 выпушчана прадукцыі на 6 млн. 283 тыс. руб. (на 1 млн. 685 тыс. руб. больш, чым у 1965).

М. А. Гіняты. Быхаў.

БЫХАЎСКІ РАЁН, у складзе Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на Пд вобласці, у верхнім цячэнні Дняпра. Пл. 2,3 тыс. км². Нас. 70,4 тыс. чал. (1969). У раёне 14 сельсаветаў. Цэнтр г. Быхаў.




Краявід каля вёскі Балонаў-Сялец.



Быхаўскі замак: *1* — разрэз галоўнага корпуса; *2* — план першага паверха.

Зах. частку раёна займае Цэнтральнабярэзінская раўніна, нахіленая на Пд, усходнюю — Аршанска-Магілёўская раўніна. Рэльеф пераважна плоска-хвалісты. Выш. 150—170 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу (Гадылёва — 30,9 млн. *т* і Зімнік — 18 млн. *т*), 3 радовішчы цагельных глін — 0,8 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Сапяжынка — 0,4 млн. *м*³), радовішча мелу Лазаравічы-Пакроўскае — 3,4 млн. *т*. Сярэдняя т-ра студз. ад —7 да —7,5, ліп. 18—18,5 °С. Ападкаў 600 *мм* за год. Вегет. перыяд 190 дзён. З Пн на Пд па тэр. раёна цячэ Дняпро з прытокамі Ухлясць, Баброўка, Лахва, на З — Грэза (прыток р. Друць). На мяжы з Кіраўскім р-нам на р. Друць створана Чыгірынскае вадасх., ГЭС. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (56,3%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (23%), тарфяна-балотныя (9,1%), алювіяльныя дзярнова-балотныя (9%) і інш. З мінер. глебаў 30,5% сугліністых, 53,5 супясчаных, 16% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 45 (цана бала 0,25 *ц/га* збожжа); кармавых угоддзяў — 34, усіх с.-г. угоддзяў — 41. Пад лесам каля 40% тэр., пераважаюць хвойныя. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы, яўрэі. Сярэдняя шчыльн. нас. 31 чал. на 1 км². Гарадскога насельніцтва 23%.



Прамысловасць тарфяная, харчовая, металаапрацоўчая. Торфапрадпрыемствы «Дняпроўскае» (657 тыс. *т* торфу ў 1969) і «Чырвоная Беларусь» (166 тыс. *т* торфу ў 1969). *Быхаўскі кансервава-агародніна-сушыльны камбінат*, хлебазавод, з-ды сухога абястлушчанага малака, цэх метал. вырабаў, міжраённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, мэблевая ф-ка, камбінат быт. абслугоўвання (Быхаў), спіртзавод (Грудзінаўка), 2 цагельныя з-ды (у в. Седзічы і Хутар), з-д вітамінавай травяной мукі ў саўгасе «Вараніно». Будуецца (1970) лёназавод у Быхаве. У 1970 у Б. р. было 18 калгасаў і 10 саўгасаў.

Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Лудчыцы)*, «XVIII парта'езд» *(Абідавічы)*, імя Дзяржынскага *(Камарычы)*, імя Жданава *(Палкі)*, імя Заслонава *(Ніжняя Тошчыца)*, імя Ільіча *(Следзюкі)*, «Іскра» *(Іскань)*, імя Калініна *(Трылесіна)*, імя Кірава *(Новы Быхаў)*, імя Куйбышава *(Ніканавічы)*, «Ленінскі шлях» *(Чырвоны Бераз)*, імя Карла Лібкнехта *(Баркалабава)*, «Новае жыццё» *(Хамічы)*, «Перамога» *(Смаліца)*, «Радзіма» *(Чырвоная Слабада)*, «Расія» *(Палянінавічы)*, «Рэвалюцыя» *(Быхаў)*, «Шлях да камунізма» *(Слалец)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Быхаўскі» *(Чорны Бор)*, «Вараніно» *(Вараніно)*, «Грудзінаўскі» *(Грудзінаўка)*, «Кіпячы» *(Дунаёк)*, «Мокранскі» *(Мокрае)*, імя Смалячкова *(Усялежжа)*, «Спадарожнік» *(Гарадзец)*, «Усход» *(Глухі)*, «Халстава» *(Халстава)*, «Ямпае» *(Ямпае)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, бульбаводстве. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 40% тэр. Асушаюцца балоты і забалочаныя землі. На 1.1.1970 асушана каля 17 тыс. *га*. Агульная пасляная пл. (тыс. *га*, 1969) 64,5, у т. л. пад збожжавымі і вернебабовымі 31,5, бульбай 12,4, тэхнічнымі 2,2, пад кармавымі культурамі 17,6. Гадуюць пераважна буйную рагатую жывёлу і свіней. На пач. 1970 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 51,8 (у т. л. кароў 24,6), свіней 32,7, авечак і коз 3,6. Па тэр. раёна праходзяць: чыгунка Ленінград — Адэса, шашэйныя дарогі Магілёў — Гомель, Магілёў — Бабруйск і інш.

У 1970 у раёне было 20 сярэдніх, 31 васьмігадовая, 66 пачатковых, 3 школы рабочай і сельскай моладзі, 18 дашкольных устаноў, 60 масавых б-к, 61 клубная ўстанова, 41 кінаўстаноўка, у т. л. 27 стацыянарных, 11 бальніц, 5 паліклінік, дыспансер, 36 фельч.-ак. пунктаў; дзіцячы касцёватуберкулёзны санаторый «Чачэвічы». У 1970 у раёне працавала 980 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 95 інжынераў, 25 аграномаў, 23 заатэхнікі, 22 вет. ўрачы, 81 урач, 630 настаўнікаў; 1555 чалавек з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Маяк Прыдняпроўя».

А. С. Ахінчыц. Мінск.

БЫХАЎЦА ЛЕТАПІС (хроніка), летапіс паліт. гісторыі Вял. кн. Літ. да 1506 і т. зв. легендарнага перыяду гісторыі Літвы да 13 ст. Каштоўная крыніца па гісторыі Беларусі, Літвы, Украіны і Расіі. Напісана прыблізна ў сярэдзіне 16 ст. на бел. мове.

Выяўлены ў 20-я г. 19 ст. настаўнікам Віленскай гімназіі І. Клімашэўскім ў 6-цы памешчыка І. Быхаўца з маёнтка Магілеўцы Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., ад прозвішча якога і атрымаў назву. Памерамі і аб'ёмам фактычнага матэрыялу найбольшая з хронік на бел. мове і таму завецца поўнай, ці трэцяй, рэдакцыяй бел.-літоўскіх летапісаў. Не мае пачатку, канца і часткі тэксту ў сярэдзіне. Аўтар хронікі, напэўна, паходзіў з беларусаў праваслаўнага веравызнання, бо найленш ведаў бел. землі па лініі Навагрудак — Слуцк — Петрыкаў і падзеі ў сям'і слуцкіх князёў. Па паліт. поглядах быў прыхільнікам магнатаў, лічыў іх ахоўнікамі магутнасці Вял. кн. Літ. і посьбітамі яго дзярж. традыцый, паслядоўна выступаў за поўную незалежнасць ад Польшчы, дакazваў, што бел.-літоўская шляхта вышэй за польскую. Пры апісанні падзей ранняга часу карыстаўся Галіцка-Валынскім (Гіпацкім) летапісам, больш познага — рознымі, цяпер часта невядомымі крыніцамі, запісваў падзеі са слоў відавочцаў ці на аснове асабістых уражанняў. Храналогія В. л. блытаная, зместкі часам памылковыя, але некаторых з іх больш няма нідзе: пра забойства вял. кн. Жыгімонта, Грунвальдскую бітву 1410, бітву пад Клецкам 1506 і інш. Першы ўрывак з Б. л. пад назвай Літоўскай хронікі надрукаваў у 1830 Т. Нарбут. І. Клімашэўскі, поўны тэкст — у 1846. У 1907 змешчана ў «Поўным зборы рускіх летапісаў» (т. 27), у 1966 — у перакл. на рус. мову.

Літ.: Хроника Быховца. Предисл., коммент. и пер. Н. Н. Улащика, М., 1966; Флоря Б. Н. О летописце Быховца, у кн.: Источники и историография славянского средневековья. Сб. ст. к материалов, М., 1967; Сушицький Т. Західньоруські літописи, як пам'ятки літератури, ч. 1—2, Київ, 1921—29; Данилович И. О литовских летописях, «Журнал Министерства народного просвещения», 1840, № 11; Тихомиров И. О составе западнорусских, так называемых литовских летописей, там жа, 1901, № 3, 5.

М. М. Улашчык. Масква.

Торфапрадпрыемства «Дняпроўскае». Вывазка торфу.



БЫХОЎСКІ Барыс Яўсеевіч [н. 14(27).8.1908, Пецярбург], савецкі заолаг-паразітолаг. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. з 1960). Чл. КПСС з 1941. Скончыў Ленінградскі дзяржаўны ун-т (1930). Акад.-сакратар Аддз. агульнай біялогіі АН СССР (з 1965). Даследаванні Б. па сістэматыцы і гісторыі развіцця ніжэйшых чарвей. Вялікі матэрыял, сабраны Б. у экспедыцыях па СССР, даў магчымасць распрацаваць і рэкамендаваць шэраг мерапрыемстваў для барацьбы з хваробамі ў рыб, перасцерагчы заражэнне чалавека і жывёлы паразітычнымі чарвямі. Пад кіраўніцтвам Б. створаны «Вызначальнік паразітаў прэснаводных рыб СССР» (1962) — першы і адзіны ў свеце практычны дапаможнік для іхтыяпаразітолагаў. Б. гал. рэдактар часопіса «Паразитология». Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.




Тв.: Моногенетические сосальщики, их система и филогения, М.— Л., 1957.

БЫХОЎСКІ Бярнард Эмануілавіч [н. 31.8 (12.9).1898, г. Бабруйск], савецкі філосаф. Д-р філас. н. (1941). Чл. КПСС з 1920. Скончыў ф-т грамадскіх навук БДУ (1923). З 1929 праф. гэтага ун-та. З 1953 праф. Маск. ін-та нар. гасп. імя Пляханава. Даследуе праблемы дыялект. і гістар. матэрыялізму, гісторыі зах.-еўрап. і сучаснай бурж. філасофіі. Дзярж. прэмія СССР 1944.

Тв.: Уводзіны ў філасофію дыялектычнага матэрыялізму, «Полымя», 1926, № 7; Психофизическая проблема в учении Спинозы, «Працы БДУ», 1927, № 14—15; Дидро о Спинозе, «Працы БДУ», 1927, № 16; Нарыс філасофіі дыялектычнага матэрыялізму, Мн., 1930; Философия Декарта, М.— Л., 1940; Метод и система Гегеля, М., 1941; Основные течения современной идеалистической философии, М., 1957; Философия неопрагматизма, М., 1959; Людвиг Фейербах, М., 1967.

БЫЦЕНСКАЯ ЦАРКВА, помнік архітэктуры барока. Пабудавана ў пач. 18 ст. (асвячопая ў 1710) у *Быцені*. Уваходзіла ў комплекс уніяцкага манастыра. У архітэктуры царквы своеасабліва спалучаліся формы каталіцкага і праваслаўнага дойлідства. Цэнтр. прастора храма, пазбаўленая дэкору, была акружана з 4 бакоў памяшканнямі і завершана ўсярэдзіне драўляным шатром, а знадворку — цагляным купалам. Выразнасць цэнтра дасягалася пластыкай ліній паўкруглых апсідаў, купала і высокага ліхтара. Царква мела высокі дзвюхвежавы фасад. Разбурана ў 1914.



Быценская царква. Разрэз, план.

БЫЦЕНЬ, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Шчара. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Быценскі». За 25 *км* на ПнУ ад Іванцэвіч, 159 *км* ад Брэста, 7 *км* ад чыг. ст. Даманава. 2292 ж., двароў 699 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання, цэх камбіната буд. матэрыялаў. Сярэдняя і васьмігадовая школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, паліклініка, антэка, дзіцячыя сад і яслі, адда. сувязі, 15 магазінаў. Арх. помнік 18 ст.— *Быценская царква*. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

БЫЦЦЁ, аб'ектыўнае, незалежнае ад свядомасці існаванне матэрыяльнага свету — прыроды і грамадства. Разуменне марксісцка-ленінскай філасофіяй грамадскага Б. як матэрыяльнага, натуральна-гістар. працэсу арабіла пераварот у поглядах на гр-ва, гісторыю, з'явілася асновай дыялектыка-матэрыялісг. тлумачэння сац. развіцця. Жыццё людзей — спецыфічна грамадскі, гістар. працэс, які не зводзіцца ні да з'яў прыроды, ні да свядомасці. Крыніцы і рухальныя сілы развіцця гр-ва ляжаць у сферы матэрыяльнай вытворчасці, а вытв. адносіны людзей вызначаюць усе інш. іх адносіны.

Значэнне паняцця Б. гістарычна мянялася, адлюстроўваючы працэс развіцця пазнання, барацьбу матэрыялізму і ідэалізму. Матэрыялісты разглядалі Б. як матэрыяльна-рэчавую субстанцыю (напр., атамы Дэмакрыта). Ідэалісты разумелі Б. як мысль, дух (напр., «ідэі» Платона) і лічылі, што «ісціннае» Б. знаходзіцца або ў богу (аб'ектыўны ідэалізм), або ў чалавеку (суб'ектыўны ідэалізм), а пачуццёвы свет ёсць выяўленне духоўнай першаасновы. У буржуазнай філасофіі вельмі пашырылася паняцце «чыстага» Б., якое характарызуецца як пазітыўнае, існуючае, рэальнае, «чыстая» сутнасць і азначае або пачуццёва дадзенае, якое разумеюць на махісцкі манер як нейтральнае ў адносінах да фізічнага і псіхічнага, або як «мысліцельныя сутнасці», якія процістаўляюцца матэрыі і духу. «Чыстае» Б. як першаснае рэальнасць заклікана ліквідаваць Б., незалежнае ад псіхікі, адкінуць паняцце матэрыі. Разглядаючы матэрыяльнасць свету і Б. як паняцці тоесныя і падкрэсліваючы аб'ектыўнасць Б., дыялектычны матэрыялізм не адмаўляе актыўнай ролі свядомасці. Пытанне пра ўзаемаадносіны грамадскага Б. і грамадскай свядомасці — гэта канкрэтызацыя *асноўнага пытання філасофіі* ў адносінах да грамадства. Гл. таксама *Гістарычны матэрыялізм*.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Святое семейство, или Критика критической критики, Соч., т. 2; Іх жа. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); Рубинштейн С. Л. Бытие и сознание, М., 1957; Протасеня П. Ф. Происхождение сознания и его особенности, Мн., 1959. *А. І. Пятрушчык.* Мінск.

БЫЧКІ (Gobiidae), сям. рыб атр. акунепадобных. Цела з таўставатаю галавою, даўж. 0,7—50 *см*. Брушныя плаўнікі, якія зрасліся, утвараюць круглы прысосак. Вядома каля 600 відаў. Жывуць уздоўж берагоў у морах, саленаватых і прэсных вадаёмах трапічнага і ўмеранага паясоў.



Бычок-пясочнік.

У СССР — 67 відаў, пераважна ў Каспійскім, Азоўскім і Чорным м. У БССР 1 від — бычок-пясочнік (Neogobius fluviatilis). Кормяцца Б. чарвякамі, ракападобнымі. Есць драпежнікі. Размнажаюцца ў вясна-летні перыяд. Прамысл. рыба.

Літ.: Гл. пры арт. *Рыбы.*

БЫЧКОВЫ, браты, удзельнікі рэвалюц. руху 70—80-х г. 19 ст.

Уладзімір Іванавіч (1861, Горкі Магілёўскай губ.— 18.8.1883). У рэвалюц. рух уключыўся ў 1878 у Кіеўскім ун-це, у 1879 арганізаваў тэрарыстычны гурток, які прыняў праграму *«Народнай волі»*. Вёў прапаганду сярод рабочых, вайскоўцаў, вучнёўскай моладзі, падрыхтаваў замах на жандарскага падпалкоўніка Судзейкіна — фактычнага кіраўніка тайнага паліт. вышуку ў Расіі. Арыштаваны 30.3.1881 і сасланы на 5 гадоў ва Усх. Сібір. 19.12.1882 уцёк з турмы, вёў рэвалюц. дзейнасць, пасля арышту В. М. *Фігнер* узначаліў Харкаўскую групу нарадавольцаў. Улетку 1883 паехаў у Томск, каб наладзіць уцёкі ссыльных. Выданы правакатарам, пры арышце супраціўляўся паліцыі і застрэліўся.

Яўген Іванавіч (1858, Горкі Магілёўскай губ.— г. см. невяд.). Вучыўся ў Горным ін-це і Кіеўскім пяхотным вуч., арганізоўваў ваен. гурткі нарадавольцаў. 30.3.1881 арыштаваны і сасланы пад нагляд паліцыі ў Падольскую губ., адкуль падтрымліваў сувязь з ваеннай арг-цыяй «Народнай волі». У студз. 1884 прыцягнуты да следства па справе забойства жандарскага падпалкоўніка Судзейкіна. Памёр у Жытоміры.

Аляксандр Іванавіч (1862, Кіеўская губ.— 27.9.1925). Вядомы дзеяч Кіеўскай групы нарадавольцаў. 30.3.1881 арыштаваны і сасланы на 3 гады ў Магілёўскую губ. пад нагляд паліцыі. У студз. 1881 прыгавораны ваен. судом да 10 гадоў катаржных работ і на пажыццёвае пасяленне ў Сібіры. 24.12. 1887 уцёк з турмы і намагаўся аднавіць «Народную волю». У вер. 1888 зноў арыштаваны і пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. У 1918 чл. Харкаўскага Савета рабочых дэп. Працаваў у Гістпарце. *М. В. Віч.* Мінск.

БЫЧКОЎ Мікалай Васілевіч (5.12.1924, в. Асеевўка Аляксінскага пав. Тульскай губ.— 30.10.1962), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. Вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. На чале аддзялення пераправіўся цераз раку, выбіў ворага з траншэі і ўтрымліваў плацдарм да падыходу асн. сіл.

БЫЧКОЎСКІ Ціт (1799, Лагойск — 1843), беларускі жывапісец. З прыгонных графа Тышкевіча. Вучыўся ў Віленскім ун-це (да 1829, у Я. Рустэма), Дрэздэне, Мюнхенскай акадэміі маст. (1836—42). Аўтар бытавых карцін з жыцця прыгонных сялян («Касец, што менціць касу», «Дзяўчына з разбітым збаном», «Музыкант настройвае віялапчэль»), партрэта Ю. Славацкага (1831, музей А. Міцкевіча ў Варшаве) і інш.

Літ.: Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960, с. 10. *Л. Н. Дробаў.* Мінск.

«БЫЧОК», старажытны беларускі народны танец. Муз. памер $^2/_4$, бытуюць варыянты ва ўмераным і хуткім тэмпах. Захоўваючы нар. аснову, прафесійныя і самадзейныя балетмайстры надалі танцу яркую сцэнічную форму (харэагр. карцінка «Бычок» у пастаноўцы К. Аляксютовіча ў Ансамблі бел. нар. песні і танца, жартоўны танец «Бычкі» ў паст. А. Апанасенкі ў Дзярж. ансамблі танца БССР і інш.).

БЫЧОК Алег Сяргеевіч (18.9.1921, мяст. Бабровіца Казялецкага пав. Чарнігаўскай губ.— 7.5.1944), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З рабочых. Чл. ВЛКСМ. З вер. да ліст. 1941 пам. камандзіра ўзвода атрада «Шпілявы», які выконваў спец. заданне ў акупаваных Калінінскай, Смаленскай і Віцебскай абл. З сак. 1942 камісар, з чэрв. 1943 камандзір спец. атрада НКУС БССР «Трэція», пазней імя Дзяржынскага, які дзейнічаў на тэр. Віцебскай і Мінскай абл.



Атрад пусціў пад адхон больш за 100 варожых эшалонаў, разбурыў больш за 4 тыс. *м* чыгункі, узарваў 23 масты, 49 аўтамашын і танкаў, 4 эл. станцыі, 11 складаў, самалёт. Загінуў у час выканання баявой аперацыі.

І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак. Мінск.

БЫЧЫХА, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета, чыг. ст. на лініі Невель — Віцебск. Аўтобусная станцыя. За 24 *км* на Пн ад Гарадка, 54 *км* ад Віцебска, каля шашы Невель — Віцебск (1 *км*). 508 ж., гасп. 190 (1970). Гарадоцкае будмантажнае ўпраўленне, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. За вызваленне Б. 17.12.1943 ад ням.-фаш. акупантаў сав. воінам М. Ф. *Забродзіну,*

І. К. *Кручкову,* І. М. Антонаву (пасмяротна), М. М. *Рудыку* (пасмяротна) прысвоена званне Герояў Сав. Саюза. Мемарыяльная дошка ў гонар *партызанскай брыгады 2-й Беларускай,* якая разбіла ням. гарнізон.

БЭЗ (Syringa), род кустоў і невялікіх дрэў сям. маслінавых. Лісце цэласнае, на кароткіх чаранках. Кветкі духмяныя, фіялетавыя, белыя, ружовыя (у садовых сартоў яны рознага адцення), у буйных пірамідальных гронках. Плод — каробачка. Вядома каля 30 відаў, пашыраных у Еўропе і Азіі. У СССР дзіка растуць 4 віды, у культуры — 2. У БССР вырошчваюцца як дэкаратыўныя: Б. звычайны, Б. касматы, Б. венгерскі, Б. персідскі, Б. кітайскі. Найб. вядомы Б. звычайны (S. vulgaris), які мае многа садовых формаў і сартоў (у ЦБС АН БССР выведзена 16 новых сартоў, у т. л. лепшыя з іх: Беларускія зоркі, Вера Харужая, Абаронцам Брэста, Канстанцін Заслонаў, Мінчанка, Партызанка, Свіцязянка і інш.). Зімаўстойлівы, высаджваецца пры ахоўным лесаразвядзенні. Расце хутка, размнажаецца пасеннем, парасткамі, атожылкамі. Драўніна Б. цвёрдая, прыгодная на такарныя вырабы. Экстракт з кветак ужываецца ў парфумнай прамысловасці.



Бэз звычайны.

Літ.: Деревья и кустарники, розы и сирень, Мн., 1968; Деревья и кустарники СССР, М., 1966.

БЭКАН (Bacon) Фрэнсіс (22.1.1561—9.4. 1626), англійскі філосаф, пачынальнік англ. матэрыялізму і эксперыментуючай навукі новага часу. Скончыў Кембрыджскі ун-т (1575). З 1617 лорд — хавальнік пячаткі пры каралю Якаве I, потым лорд-канцлер. Матэрыялізм Б. метафізічны, але накіраваны супраць сярэдневяковай схаластыкі і багаслоўя. У трактаце «Новы Арганон» (1620) распрацаваў антысхаластычны індукцыйны метад пазнання, асн. на рацыянальным аналізе доследаў. Аб'ектам даследавання зрабіў прыроду і лічыў назіранне, эксперымент, пачуццёвае ўспрыманне асновай навук. пазнання. Выступаў супраць адарванай ад навукі філасофіі і імкнуўся абгрунтаваць яе новым, сучасным яму навук. матэрыялам. Матэрыю разглядаў як аб'ектыўную разнастайнасць пачуццёвых якасцей і адхіляў уяўленне пра яе як пра пасіўны, інертны пачатак. Распрацаваў класіфікацыю навук. Як матэрыяліст непаслядоўны, рабіў ус-




тупкі тэалогіі. Не разумеў сувязі і ўзаемадзеяння індукцыі і дэдукцыі, і таму яго індукцыйнаму метаду ўласцівыя абмежаванасць і аднабаковасць. У паліт. поглядах прыхільнік манархіі, адмоўна ставіўся да буйнога феад. дваранства, адстойваў развіццё паліт. магутнасці буржуазіі.

Тв.: О принципах и началах, М., 1937; Новый Органон, М., 1938.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Святое семейство, или Критика критической критики, Соч., т. 2, с. 142—144.

БЭЛЬКА (ням. Balken брус), канструктыўны элемент будынкаў і збудаванняў, машын, станкоў, які ўспрымае папярочныя нагрузкі і працуе пераважна на згінанне.

Пашыраны наст. схемы Б. (гл. рыс.): простая (*1*), многапралётная (*2*), кансоль (*3*), з замацаванымі канцамі (*4*), двухкансольная (*5*), трохпралётная кансольная (*6*). Паводле формы папярочнага сячэння бываюць прамавугольныя, двухтаўровыя, таўровыя, каробчатага сячэння і інш. Пры згінанні найб. нармальныя напружанні ўзнікаюць у крайніх гранях сячэння, таму рацыянальныя Б. каробчатага і двухтаўровага профілю, а таксама рашоточатыя ці *фермы.* Арматуру ў жалезабетонных Б. размяшчаюць у расцягнутай зоне сячэння. Робяць Б. з металу, жалезабетону, дрэва.



БЭНЬСІ, горад на ПнУ Кітая, у правінцыі Ляанін. Чыг. вузел. 530 тыс. ж. (1957). Цэнтр здабычы кам. вуг., жал. руды, гліназёмных сланцаў. Чорная і каляровая металургія. ЦЭЦ. Вытв. цэменту і інш. буд. м. Горны ін-т.

БЭР Карл Максімавіч [17(28).2.1792, Эстляндыя — 16(28).11.1876], рускі натураліст, заснавальнік эмбрыялогіі ў Расіі. Ардынарны акад. Пецярбургскай АН (1828, член-кар. 1826). Скончыў мед. ф-т Дэрпцкага ун-та (1814). Праф. Кёнігсбергскага ун-та (з 1819), Пецярбургскай медыка-хірургічнай акад. (1841—52). Вывучаў эмбрыянальнае развіццё жывёл. У 1827 апублікаваў даследаванне «Пра паходжанне яйца млекакормячых і чалавека». Класічная праца «Пра гісторыю развіцця жывёл» (1828—37). Паказаў, што ў працэсе эмбрыянальнага развіцця асобіны спачатку выяўляюцца прыкметы тыпу, потым класа, атрада, сямейства, роду, віду і ў канцы індывідуальныя адзнакі. Б. зрабіў геагр. апісанне Каспійскага м., а таксама апісаў з'яву падмыву берагоў рэк пад уплывам вярчэння Зямлі. Гл. *Бэра закон.*

Літ.: Райков Б. Е. Карл Бэр, его жизнь и труды, М.— Л., 1961.

БЭРА ЗАКОН, палажэнне, абгрунтаванае К. М. *Бэрам* (1857), якое тлумачыць падмыў берагоў рэк мерыдыянальнага кірунку. У Паўн. паўшар'і падмываецца правы бераг, у Паўд.— левы з прычыны адхілення масы вады пад уплывам вярчэння Зямлі. Узнікае асіметрычная рачная даліна. Раней такія меркаванні былі выказаны рус. даследчыкам П. А. Слаўцовым (1826, 1844). Франц. вучоны Ж. Бабінэ даказаў, што адхіляюцца ўсе рэкі, незалежна ад напрамку іх цячэння, таму гэтая заканамернасць наз. яшчэ законам Бэра — Бабінэ.

БЭРА ЗІМОВАЯ МІЧУРЫНСКАЯ, селекцыйны зімовы сорт грушы. Выведзены І. У. Мічурыным (1914) скрыжаваннем сеянца Усурыйскай грушы і паўд. сорту Раяль. Плады важаць 100—140 *г*, зеленавата-жоўтыя з бураватажоўтым размытым румянцам. Мякаць буйназярністая, жаўтавата-белая, у ляжалых пладоў духмяная, сакаўная, паўмаслістая вінасалодкая. Паспявае ў канцы вер., спажываецца ў ліст.— студз., можа ляжаць да лютага. Зімаўстойлівы і ўрадлівы сорт. Пладаносіць з 6—8 гадоў, у 20—25 гадоў дае 140—250 *кг* пладоў з дрэва. Уключана ў стандартны сартымент па ўсіх садовых зонах БССР. Найлепшыя апыляльнікі: *Вінёўка, Безнасенка, Бэра слуцкая.*



БЭРА ЛОШЫЦКАЯ, беларускі селекцыйны сорт грушы. Выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы Э. П. Сюбаравай. Плады важаць 80—90 *г*, круглявыя, зеленавата-жоўтыя з аранжавым румянцам. Мякаць белая, дробназярністая, сакаўная, салодкая, без камяністых клетак. Пладаносіць на 4—5-ы год, у 10 гадоў дае да 50 *кг* пладоў з дрэва. Грушы паспяваюць увосень. Найлепшыя апыляльнікі: *Панна*, Масляністая ліфляндская. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Груша.*

БЭРА СЛУЦКАЯ, беларускі асенні сорт грушы. Плады важаць 100—200 *г*, тупаканічныя, залаціста-жоўтыя з бура-чырванаватым румянцам. Мякаць белая, дробназярністая, сакаўная, салодкая, духмяная. Плады паспяваюць у канцы верасня і ляжаць свежыя да снежня. У цэнтр. і паўд. раёнах БССР адзін з асн. сартоў грушы, найб. пашыраны ў Слуцкім р-не. Зімаўстойлівы, даўгавечны (да 100 гадоў). Пладаносіць з 8—10 гадоў; 20-гадовае дрэва дае ў сярэднім 150—250 *кг* пладоў. Найлепшыя апыляльнікі: *Вінёўка, Сапяжанка, Бэра лошыцкая.* Іл. гл. на ўкл. да арт. *Груша.*

БЭТА-РАСПАД (β-распад), радыеактыўнае ператварэнне атамных ядраў, у выніку якога ядро выпрамяняе электрон (пазітрон) і электроннае антынейтрына (нейтрына). Б.-р. свабоднага ці ўнутрыядзернага нейтрона (пратона) адбываецца паводле схем: $n \to p + \beta^- + \bar{\upsilon}$ і $p \to n + \beta^+ + \upsilon$, дзе n і p — нейтрон і пратон, β^- і β^+ — *бэта-часцінкі* (электрон і пазітрон), $\bar{\upsilon}$ і υ — нейтрына і антынейтрына.

У выпадку электроннага (пазітроннага) Б.-р. адзін з нейтронаў (пратонаў) ядра ператвараецца ў пратон (нейтрон), і ядро зрушваецца ў табліцы Мендзялеева на адзін нумар управа (улева). Да Б.-р. адносіцца таксама захоп уласнага электрона ядром атама, т. зв. *е*-захоп, у выніку чаго адзін з пратонаў ядра ператвараецца ў нейтрон, і ядро зрушваецца ў табліцы Мендзялеева на адзін нумар улева. Вядома больш за 900 β-радыеактыўных ізатопаў. Усе хімэлементы маюць ізатопы, здольныя да той ці інш. разнавіднасці Б.-р. Час жыцця β-радыеактыўных ядраў вагаецца ад $2{,}5 \cdot 10^{-2}$ *сек* ($^{12}_{5}$B) да $4 \cdot 10^{12}$ *гадоў* ($^{187}_{75}$Re). Пры Б.-р. не захоўваецца прасторавая *цотнасць*, што выяўляецца ў асіметрыі прасторавых кірункаў руху электронаў, якія выпрамяняюцца ядрамі: у кірунку *спіна* ядраў вылятае менш электронаў, чым у адваротным.

Г. В. Шышкін. Мінск.

БЭТАТРОН, гл. *Паскаральнікі вараджаных часцінак.*

БЭТА-ЧАСЦІНКІ (β-часцінкі), элементарныя часцінкі — электроны (β^-) і пазітроны (β^+), якія выпрамяняюцца атамнымі ядрамі пры *бэта-распадзе.* Зарад Б.-ч. $\pm 1{,}60210 \cdot 10^{-19}$ *к* («+» для пазітрона і «—» для электрона), маса спакою $9{,}1 \cdot 10^{-31}$ *кг*, спін $\frac{1}{2}\hbar$, сярэдняя энергія электронаў пры распадзе натуральных β-радыеактыўных элементаў (0,25 ÷ 0,45) *Мэв.*

БЮДЖЭТ (англ. budget сумка), каштарыс (роспіс) грашовых даходаў і расходаў на пэўны перыяд. Гл. *Бюджэт дзяржаўны, Бюджэтнае планаванне, Мясцовыя бюджэты.*

БЮДЖЭТ ДЗЯРЖАЎНЫ, выражаны ў грашовых сумах роспіс даходаў, якія паступаюць у распараджэнне органаў дзярж. улады, і расходаў, што робяць гэтыя органы. Залежыць ад характару грамадскага і дзярж. ладу краіны, пры змене якога мяняецца і эканам. сутнасць бюджэту, змест і структура яго даходаў і расходаў. Пры сацыялізме, эканам. асновай якога з'яўляецца грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці, Б. дз.— асноўны фінансавы план утварэння і выкарыстання агульнадзярж. фонду грашовых сродкаў краіны. У адзіны Б. дз. СССР уваходзяць саюзны бюджэт, бюджэты саюзных рэспублік і бюджэт сац. страхавання. Праз бюджэт размяркоўваецца значная частка нац. даходу паміж вытв. і невытв. сферамі дзейнасці і ўнутры іх, паміж саюзнымі і аўтаномнымі рэспублікамі, краямі, абласцямі, раёнамі і г. д., што забяспечвае неабходную прапорцыю ў развіцці нар. гасп., удасканальвае структуру вытворчасці і фондаў грамадскага спажывання. Ствараецца бюджэт на прынцыпах дэмакр. цэнтралізму і ленінскай нац. палітыкі.

Гал. крыніца сродкаў Б. дз. СССР — грашовыя паступленні ад дзярж. і кааператыўных прадпр.: падатак з абароту, адлічэнні ад прыбытку, плата за вытв. фонды, фіксаваныя плацяжы, узносы на сац. страхаванне, падаходны падатак з калгасаў і каап. арг-цый. У бюджэт паступаюць таксама добраахвотныя і абавязковыя плацяжы ад насельніцтва, удзельная вага якіх у Б. дз. змяншаецца. У 1950 дзярж. падаткі і інш. паступленні ад насельніцтва склалі 16,3% даходаў Б. дз., у 1968—

8,7%. Адначасова даходы бюджэту паступова павялічваюцца за кошт высокіх тэмпаў развіцця сацыялісц. эканомікі, росту нац. даходу і ажыццяўлення эканам. рэформы 1965. Плацяжы ад сацыялісц. гасп. ў бюджэце СССР выраслі з 47,6 млрд. руб. у 1955 да 119,4 млрд. руб. у 1968, або ў 2,5 раза. Сродкі Б. дз. СССР пераважна ідуць на развіццё нар. гасп. і сацыяльна-культурныя мерапрыемствы (гл. табл. 1). Частка сродкаў ідзе на абарону, утрыманне дзярж. апарату. У 1968 у нар. гасп. накіравана 58,7 млрд. руб., або 45,6% усёй сумы бюджэтных расходаў. На сац.-культ. мерапрыемствы ў 1950 выдзелена 11,7 млрд. руб., а ў 1968 — 48,3 млрд. руб., больш чым у 4 разы. На абарону ў 1968 асігнавана 16,7 млрд. руб., або 13% супраць 20% у 1950. Расходы на ўтрыманне органаў дзярж. улады і кіравання займаюць невялікую ўдз. в. і паступова скарачаюцца ў выніку ўдасканалення апарату кіравання народнай гаспадаркі і ажыццяўлення рэжыму эканоміі. Аб'ём даходаў Б. дз. ў 1968 у параўнанні з 1940 павялічыўся ў 7,3 раза. Штогод бюджэт складаецца і выконваецца з перавышэннем даходаў над расходамі. На кожны год Б. дз. абмяркоўваецца і зацвярджаецца сесіяй Вярх. Савета СССР. Закон пра Б. дз. заўсёды публікуецца і мае абавязковы дырэктыўны характар.

Бюджэт БССР — яскравы прыклад ажыццяўлення ленінскай нац. палітыкі. Праз бюджэт Сав. дзяржава накіроўвала ў БССР вялікія сродкі на пераадоленне векавой адсталасці, на індустрыялізацыю, на аднаўленне нар. гасп. ў пасляваенны перыяд. Расходы бюджэту БССР у 1969 выраслі ў параўнанні з 1960 больш як удвая (гл. табл. 2).

Б. дз. сацыялісц. краін сваім эканам. зместам падобныя на бюджэт СССР. Усе яны выконваюцца з перавышэннем даходаў над расходамі. Удз. в. плацяжоў сацыялісц. прадпр. і арг-цый складае 70—90%, а падаткі з насельніцтва — менш за 10%. Каля 90% сродкаў Б. дз. гэтых краін ідзе на развіццё эканомікі і культуры, на павышэнне дабрабыту народа.

Пры капіталізме Б. дз. выражае інтарэсы пануючых класаў і выкарыстоўваецца бурж. дзяржавай як сродак дадатковай эксплуатацыі працоўных. Гал. крыніца бюджэтаў капіталіст. краін — падаткі, якія бяруцца пераважна з працоўных, але выкарыстоўваюцца гэтыя сродкі не ў іх інтарэсах. У перыяд агульнага крызісу капіталізму асабліва хутка растуць расходы на ваен. мэты ў сувязі з мілітарызацыяй эканомікі капіталіст. краін, з фінансаваннем ваен. блокаў, падрыўной дзейнасцю супраць сацыялісц. краін і падтрымкай рэакц. рэжымаў. У 1968—69 ваенныя расходы ў федэральным бюджэце ЗША склалі 81,3 млрд. долараў супраць 46 млрд. долараў у 1959—60. На вайну ў В'етнаме штогод затрачваецца каля 30 млрд. долараў. На душу насельніцтва ваен. расходы ў ЗША выраслі ў 1968—69 больш як у 100 разоў у параўнанні з 1913—14. Павялічваюцца таксама субсідыі манаполіям, расходы на ўтрыманне паразітычнага апарату дзярж. кіравання. Некат. бурж. эканамісты (Дж. М. Кейнс, А. Хансен, У. Беверыдж — аўтары тэорыі «бюджэтнага накачвання») апраўдваюць гэтыя расходы капіталіст. краін, сцвярджаюць, што яны ажыўляюць гасп. дзейнасць і спрыяюць уздыму эканомікі. На самай справе рост гэтых расходаў пагаршае становішча падаткаплацельшчыкаў, узмацняе хранічны дэфіцыт бюджэту капіталіст. краін.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 9, с. 78—85; Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, разд. 24, с. 710—734; Ленін У. І. Па поваду дзяржаўнага роспісу, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 6); Государственный бюджет СССР, М., 1968.

М. Дз. Гарбачоў, У. М. Скуратовіч. Мінск.

Табліца 1

Асноўныя даходы і расходы дзяржаўнага бюджэту СССР (у млрд. руб.)

	1940	1946	1960	1965	1968	1970 (план)
Даходы — усяго	18,0	32,5	77,1	102,3	130,8	144,9
З іх паступленні ад сацыялісц. гаспадаркі	16,0	27,5	70,1	93,9	119,4	131,3
Іх удзельная вага ў дзярж. бюджэце (у %)	88,8	84,5	91,0	91,8	91,3	90,6
Расходы — усяго	17,4	30,8	73,1	101,6	128,6	144,7
У тым ліку:						
на народную гаспадарку	5,8	10,6	34,1	44,9	58,7	63,5
на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы	4,1	8,0	24,9	38,2	48,3	54,8
Удзельная вага расходаў на народную гаспадарку і сацыяльна-культурныя мерапрыемствы (у % да агульнай сумы расходаў бюджэту)	57,0	60,5	80,8	81,8	83,3	81,8

Табліца 2

Асноўныя даходы і расходы дзяржаўнага бюджэту БССР (у млн. руб.)

	1940	1946	1960	1965	1969	1970 (план)
Даходы — усяго	229,4	260,9	1319,4	1915,6	2848,0	2743,7
З іх паступленні ад сацыялісц. гаспадаркі	170,2	220,8	1221,8	1797,9	2658,9	2535,2
Іх удзельная вага ў дзярж. бюджэце (у %)	74,2	84,6	92,6	93,9	93,4	92,4
Расходы — усяго	216,3	251,9	1292,9	1885,2	2755,8	2743,7
У тым ліку:						
на народную гаспадарку	50,8	74,4	686,5	931,6	1476,4	1405,1
на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы	130,1	138,7	548,5	886,7	1150,4	1245,2
Удзельная вага расходаў на народную гаспадарку і сацыяльна-культурныя мерапрыемствы (у % да агульнай сумы расходаў бюджэту)	83,7	84,6	95,5	96,5	97,2	96,6

БЮДЖЭТ РАБОЧАГА ЧАСУ, рэальны рабочы час аднаго работніка за год, квартал або месяц. З яго дапамогай вызначаюць патрэбу ў рабочых (працаёмкасць вытв. пра-

грамы дзеліцца на Б. р. ч.) і робяць разлікі даплат да асн. заработнай платы.

Разлічваецца ў сярэднім па прадпрыемстве, цэху, участку або групах рабочых, якія маюць адносна вы-ковы графікі работы і працягласць адпачынку. Вызначаецца шляхам вылічэння з каляндарнага часу выхадных і святочных дзён і нявыхадаў па хваробе, у сувязі з чарговымі, дадатковымі адпачынкамі і водпускам па цяжарнасці і родах, выкананнем дзярж. і грамадскіх абавязкаў, а таксама ліку гадзін, на які паменшаны рабочы дзень падлеткаў і маці з грудзімі дзецьмі. У справаздачны Б. р. ч. уключаюцца прагулы, цэладзённыя і ўнутрызменныя прастоі.

Б. В. Пашкевіч. Мінск.

БЮДЖЭТНАЕ ПЛАНАВА́ННЕ, працэс складання, разгляду, зацвярджэння і выканання бюджэту. Састаўная частка нар.-гасп. планавання. Вызначае памер дзярж. рэсурсаў і забяспечвае іх рацыянальнае выкарыстанне, стварае мат. і фін. рэзервы, памагае знаходзіць правільныя прапорцыі ў размеркаванні сродкаў паміж фондамі накаплення і спажывання, галінамі гаспадаркі, эканамічнымі раёнамі.

Ажыццяўляецца (з дапамогай *балансавага метаду*) органамі дзярж. улады і кіраўніцтвам прадпрыемстваў, устаноў пры шырокім удзеле працоўных. Каардынацыя Б. п. ўскладзена на Мін-ва фінансаў СССР, якое на аснове паказчыкаў плана нар. гасп., галіновых вводных планаў і каштарысаў складае праект дзярж. бюджэту і перадае яго на разгляд у Савет Міністраў СССР, Савет Міністраў СССР — у планава-бюджэтныя камісіі абедзвюх палат Вярх. Савета СССР. На аснове Закону аб дзярж. бюджэце разглядаюцца і зацвярджаюцца бюджэты саюзных і аўтаномных рэспублік, *мясцовыя бюджэты*, пасля чаго мін-вы, ведамствы і выканкомы ўдакладняюць і зацвярджаюць фін. планы і каштарысы для падведамных ім устаноў і прадпрыемстваў. Выкананне бюджэту, якое кантралюе Мін-ва фінансаў СССР, ажыццяўляецца на аснове роспісу даходаў і расходаў. Б. п. не спыняецца і ў працэсе выканання бюджэту. Пры выяўленні рэзерваў росту даходаў уносяцца змены ў планавыя заданні, у перамяшчэнне бюджэтных крэдытаў і г. д. Для пакрыцця неадкладных расходаў на нар. гасп. і сац.-культ. мерапрыемствы дапускаюцца сродкі з рэзервовых фондаў Савета Міністраў СССР і Саветаў Міністраў саюзных рэспублік. Працэс Б. п. ўдасканальваецца шляхам цеснай сувязі з вытв. планамі, узмацненнем эканам. метадаў у планаванні, выкарыстаннем матэм. метадаў і механізацыі вылічальных работ.

Літ.: Гл. пры арт. *Бюджэт дзяржаўны.*

М. І. Ткачук. Мінск.

БЮДЖЭТНАЕ ПРАВА, сукупнасць юрыдычных нормаў, якія рэгулююць адносіны паміж вышэйшымі і мясцовымі органамі дзярж. улады і дзярж. кіравання, што ўзнікаюць у сувязі з размеркаваннем дзярж. даходу, а таксама пры вызначэнні, складанні, размеркаванні, зацвярджэнні і выкананні бюджэтаў. Асн. палажэнні Б. п. вызначаны Канстытуцыяй СССР і канстытуцыямі саюзных і аўт. рэспублік. Б. п. мае на мэце забяспечыць кожнаму органу дзярж. улады самастойную і ўстойлівую матэрыяльную базу для будаўніцтва камунізма, умацавання абараназдольнасці нашай краіны і павышэння дабрабыту сав. народа. У аснове рэгулявання бюджэтных адносін ляжаць ленінскія прынцыпы федэральнага ладу СССР, нац. палітыкі, дэмакр. цэнтралізму. Б. п. вызначае кампетэнцыю органаў дзярж. улады і дзярж. кіравання Саюза ССР, саюзных рэспублік і мясцовых Саветаў па вызначэнні, размеркаванні і выкананні бюджэтаў.

Вярх. Савет СССР зацвярджае дзярж. бюджэт СССР, вызначае падаткі і даходы, якія паступаюць на ўтварэнне ўсіх бюджэтаў, парадак размеркавання даходаў і расходаў паміж бюджэтамі, зацвярджае справаздачу пра выкананне дзярж. бюджэту, выдае заканадаўчыя акты, што рэгулююць бюджэтныя адносіны ў СССР. Савет Міністраў СССР арганізуе выкананне дзярж. бюджэту СССР, разглядае праект і справаздачу пра яго выкананне, уносіць іх на зацвярджэнне Вярх. Савета СССР і інш. Вярх. Саветы саюзных рэспублік зацвярджаюць бюджэты саюзных рэспублік на аснове Закону аб дзярж. бюджэце СССР, вызначаюць аб'ёмы дзярж. бюджэтаў абласцей, краёў і гарадоў рэсп. падпарадкавання, зацвярджаюць справаздачы пра выкананне дзярж. бюджэту рэспублікі, вызначаюць бюджэтныя правы мясцовых Саветаў. Саветы Міністраў саюзных рэспублік складаюць дзярж. бюджэты і справаздачы пра іх выкананне, робяць захады для выканання рэсп. і мясцовага бюджэтаў, ажыццяўляюць агульнае кіраванне бюджэтамі мясцовых Саветаў. Мясцовыя Саветы дэп. працоўных і іх выканкомы складаюць і зацвярджаюць мясцовыя бюджэты, кіруюць іх выкананнем, зацвярджаюць справаздачы пра іх выкананне. Гл. таксама *Бюджэт дзяржаўны.*

Літ.: Законы о бюджетных правах Союза ССР, союзных и автономных республик и местных Советов депутатов трудящихся, М., 1962; Коган М. Л. Бюджетные права союзных республик, М., 1960; Пискотин М. И. Бюджетные права местных Советов депутатов трудящихся, М., 1961.

В. С. Юрчанка. Мінск.

БЮДЖЭТНАЯ СТАТЫСТЫКА, статыстычны ўлік дзярж. і мясцовых бюджэтаў; галіна сац.-эканам. статыстыкі, якая вывучае аб'ём, структуру і дынаміку нар. спажывання. Звесткамі для Б. с. з'яўляюцца матэрыялы *бюджэтных абследаванняў.*

БЮДЖЭТНЫ ГОД, перыяд, роўны 12 месяцам, на працягу якога дзейнічае зацверджаны бюджэт. У сацыяліст. краінах і некат. капіталіст. (Францыя, Бельгія, Нідэрланды, Швейцарыя і інш.) Б. г. супадае з каляндарным, у інш. краінах працягваецца з 1 крас. да 31 сак. (Вялікабрытанія, Канада, Японія, Гана і інш.) або з 1 ліп. да 30 чэрв. (ЗША, Італія, Швецыя, Нарвегія і інш.).

БЮДЖЭТНЫЯ АБСЛЕДАВАННІ, выбарачныя статыстычныя абследаванні жыццёвага ўзроўню насельніцтва. У СССР праводзяцца па адзінай праграме з мэтай вывучыць даходы, расходы і спажыванне сем'яў рабочых, служачых, калгаснікаў і інш. сац. груп насельніцтва.

Звесткі пра бюджэты сем'яў збіраюцца апытаннем дарослых членаў (па іх згодзе), выкарыстаннем іх рэгулярных запісаў пра свае даходы і расходы, а таксама некат. дакументаў: разліковых ведамасцей, пенсійных кніжак і г. д. У БССР першае абследаванне бюджэтаў рабочых і служачых праведзена ў 1921, бюджэтаў сялян у 1922. У 1970 ЦСУ БССР абследуе 1002 бюджэты рабочых і служачых і 1548 бюджэтаў калгаснікаў. Звесткі Б. а. выкарыстоўваюцца для таго, каб планаваць далейшае павышэнне дабрабыту сав. народа.

Мэта Б. а. у капіталіст. краінах — затушаваць супярэчнасці паміж працай і капіталам. Таму бурж. статыстыкі, праводзячы Б. а., наўмысна паменшваюць прыбыткі буржуазіі і перабольшваюць даходы працоўных.

Літ.: Матюха И. Я. Статистика бюджетов населения, М., 1967. *А. Р. Казачонак.* Мінск.

«БЮЛЕТЭНЬ ЦК КПЗБ», нелегальная камуністычная газета, орган ЦК КПЗБ для

ўнутрыпартыйнай інфармацыі. Выдавалася ў Вільні з 20.1.1927 да 1936, звычайна 1 раз на месяц, на бел., рус. і польскай мовах. Тыраж да 5 тыс. экз. Друкавала найб. важныя пастановы і рашэнні ЦК КПЗБ, інструктыўныя матэрыялы па пытаннях агітацыі, прапаганды і парт. буд-ва, тэзісы да дакладаў на сходах парт. ячэек; асвятляла дзейнасць ЦК, яго аддзелаў і мясцовых парт. арг-цый. Рэдагавалі газету чл. Бюро ЦК КПЗБ: Л. І. *Родзевіч*, А. А. *Альшэўскі* і інш.

І. П. Хайратовіч. Мінск.

«БЮЛЛЕТЭНЬ ВОЕННО-РЕВОЛЮЦИОННОГО КОМИТЕТА X АРМИИ», штодзённая бальшавіцкая газета, якая выдавалася ў Маладзечне з 12.11.1917 на рус. мове. З 1.1.1918 наз. «Известия армейского комитета X армии», з 6.1.1918 — *«Известия армейского Совета депутатов X армии».*

«БЮЛЛЕТЭНЬ ВЫСШЕГО СОВЁТА НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА СОВЕТСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ РЕСПУБЛИКИ ЛИТВЫ И БЕЛОРУССИИ», часопіс афіцыйна-інфармацыйнага характару. Выйшаў адзін нумар у сак. 1919 у Вільні на рус. мове. Надрукаваў матэрыялы пра развіццё прамысл. рэспублікі, дэкрэты і пастановы Урада ССР Літвы і Беларусі на асобных галінах нар. гасп.

«БЮЛЛЕТЭНЬ МІНСКОГО СОВЁТА РАБОЧИХ И СОЛДАТСКИХ ДЕПУТАТОВ», газета; орган Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Выдавалася ў 1917 у Мінску, на рус. мове. У 1-м нумары (27.10.1917) надрукаваны загад Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў «Да насельніцтва г. Мінска і ваколіц», у якім паведамлялася, што бурж. Часовы ўрад скінуты, пра пераход улады ў горадзе ў рукі Савета, пра адкрыццё 2-га Усерасійскага з'езду Саветаў. У наст. нумарах газета змясціла дэкрэты 2-га Усерасійскага з'езду Саветаў аб міры і аб зямлі, а таксама інш. дакументы і распараджэнні органаў Сав. улады, паведаміла пра ўтварэнне Савета Народных Камісараў на чале з У. І. Леніным.

Г. Л. Напрэеў. Мінск.

БЮЛЬ-БЮЛЬ (сапр. Мамедаў) Рза аглы (22.6.1897, м. Хан Багы Елізаветпольскай губ. — 26.9.1961), азербайджанскі савецкі спявак (лірыка-драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1938). Праф. (1940). Быў нар. спевакам (хапендэ). З 1920 саліст Азерб. дзярж. т-ра, пазней — Т-ра оперы і балета імя Ахундава. Спалучаў нар. манеру спявання з традыцыямі рус. і італьян. вакальных школ. Вышэйшае творчае дасягненне Б.-Б. — вобраз Кёр-аглы («Кёр-аглы» У. Гаджыбекава). Дзярж. прэмія СССР 1950 за выкананне нар. песень. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

БЮРАКРАТЫЗМ (франц. bureaucratisme, ад bureau бюро + грэч. cratos улада), сістэма кіравання і вядзення спраў у эксплуататарскіх дзяржавах, якая характарызуецца поўнай адарванасцю ад жыцця, дэспатычнымі метадамі кіравання, далёкімі ад інтарэсаў народа, і ажыццяўляецца прывілеяванай касцай чыноўнікаў.

У перыяд імперыялізму рэзка ўзмацняецца бюракратызацыя ўсяго гасп. жыцця. Дзярж. кіраванне ўводзіцца да ваенна-бюракрат. цэнтралізму, падпарадкавання дзярж. апарату буйным капіталіст. манаполіям. Для ўзбагачэння манаполій, задушэння рабочага руху і нац.-вызв. барацьбы, ратавання капіталіст. ладу, развязвання агрэс. войнаў дзярж.-манапалістычны капіталізм усё больш расшырае свой ваенна-бюракратычны апарат, і асабліва органы прыгнёту (паліцыю, армію і інш.).

У СССР і інш. сацыяліст. краінах знішчаны сацыяльна-эканам. і паліт. прычыны Б. і створаны сапраўды нар. органы дзярж. кіравання. З моманту свайго ўзнікнення сацыяліст. дзяржавы рашуча змагаюцца з Б. як перажыткам капіталізму ў свядомасці людзей, які выражаецца ў цяганіне, канцыляршчыне, зняважлівых адносінах да справы, калі важней за сутнасць ставіцца фармальнасць.

К. Л. Патаенка. Мінск.

БЮРГЕР (Bürger) Готфрыд Аўгуст (31.12.1747, Мольмерсвендэ — 8.6.1794), нямецкі паэт эпохі *«Буры і націску».* Сын свяшчэнніка. Стаяў за дэмакратызацыю і агульнадаступнасць ням. нац. мастацтва. Лірыка Б. антыфеад. характару, цесна звязаная з фальклорам («Селянін свайму найсвятлейшаму тырану», «Герб», «Дваранін і селянін»). Асабліва вядомыя балады Б., сярод іх вылучаецца «Ленора» (нап. 1773, рус. пер. В. Жукоўскага). Прыхільнік франц. бурж. рэвалюцыі, якой прысвяціў шэраг вершаў («Дзеля каго, добры нямецкі народ...»).

Тв.: Рус. пер. — Удивительные приключения барона Мюнхгаузена, М. — Л., 1961.

Літ.: Лозинская Л. Я. Бюргер, у кн.: История немецкой литературы, т. 2, М., 1963.

БЮРГЕРСКІЯ ШКОЛЫ (ад ням. Bürger гараджанін), павышаныя пачатковыя вучылішчы для сыноў рамеснікаў, дробных гандляроў і інш. Існавалі ў 17—18 ст. у гарадах Германіі.

Акрамя агульнай, Б. ш. давалі і прафесійную, прыкладную адукацыю. Іх стварэнне давала магчымасць дваранству вучыць у сярэдняй школе (гімназіі) толькі сваіх дзяцей. У 19 ст. Б. ш. ператв. ў вышэйшыя пач. і рэальныя вучылішчы.

БЮРГЕРСТВА (ням. Bürgertum, ад Bürger гараджанін, жыхар горада), сярэдні слой гарадскога насельніцтва ў Зах. Еўропе сярэдніх вякоў, які складаўся з вольных майстроў-рамеснікаў, сярэдніх і дробных гандляроў. З развіццём феад. адносін адбывалася расслаенне Б. Дробныя рамеснікі, страціўшы эканам. самастойнасць, папаўнялі *плебейства.* У 16—18 ст. з часткі Б., што перайшла на капіталіст. метад вытворчасці, сфарміравалася *буржуазія.*

БЮРО КАМІТЭТАЎ БОЛЬШАСЦІ (БКБ), бальшавіцкі партыйны цэнтр, створаны па ініцыятыве У. І. Леніна для падрыхтоўкі і склікання III з'езду РСДРП. Меншавікі, нацярпеўшы паражэнне на *Другім з'ездзе РСДРП* (1903), ігнаравалі яго рашэнні. У 1903 яны захапілі большасць у рэдакцыі «Искры» і Савеце партыі, у 1904 — у ЦК РСДРП. Таму Ленін ставіў задачу стварыць новыя парт. цэнтры, якія выказвалі б волю партыі і склікалі чарговы з'езд РСДРП. Пачатак стварэнню БКБ дала нарада 22 бальшавікоў (жн. 1904). Афармілася яно на

трох абл. нелегальных канфер. бальшавіцкіх к-таў у Расіі: Паўднёвай, Каўказскай і Паўночнай. У БКБ уваходзілі У. І. Ленін (кіраўнік), М. М. *Літвінаў*, М. М. Лядаў, С. І. *Гусеў*, Р. С. Зямлячка, П. П. Румянцаў, А. А. Багданаў і інш. Члены БКБ выязджалі на месцы для барацьбы супраць меншавікоў і прымірэнцаў. У Паўн.-Зах. і Палескі к-ты РСДРП, Мінск, Гомель, Бабруйск прыязджалі Літвінаў, Гусеў, У. І. *Неўскі* (Калеснікаў). Ленін вёў перапіску са старшынёй Палескага к-та М. К. Уладзіміравым. З 28 мясцовых к-таў за скліканне з'езду выказаўся 21, у т. л. Палескі і Паўн.-Зах. к-ты, Бабруйская, Віцебская і Мінская групы РСДРП. Пад націскам мясцовых парт. арг-цый ЦК пачаў перагаворы з БКБ пра падрыхтоўку да з'езду. 12.3.1905 з прадстаўнікоў БКБ і ЦК створаны Арганізацыйны к-т. У найвастрэйшай барацьбе супраць меншавікоў і прымірэнцаў БКБ і газ. «Вперед» падрыхтавалі і ў крас. 1905 склікалі *Трэці з'езд РСДРП*.

Літ.: Ленін У. І. Паведамленне аб утварэнні Бюро Камітэтаў Большасці.— Паведамленне аб утварэнні Арганізацыйнага камітэта і аб скліканні III чарговага з'езда Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, Тв., т. 7 (Полн. собр. соч., т. 9); Ярославский Е. Кто мы, что хочуць ашукаць? — Пара скончыць.— Да партыі.— Канферэнцыі камітэтаў, Тв., т. 8 (там жа, т. 9); Ярославский Е. Пісьмо М. К. Уладзіміраву. 15.8.1904, Тв., т. 34 (там жа, т. 46); История Коммунистической партии Советского Союза, т. 1 (с. 483—526), т. 2 (с. 34—45), М., 1966—67; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, с. 73—112. *С. Л. Саламаха.* Мінск.

БЮРО НАДВОР'Я, установа Гідраметэаралагічнай службы, якая забяспечвае насельніцтва, народнагаспадарчыя і інш. ўстановы інфармацыяй пра стан гідраметэаралагічнага рэжыму (надвор'я, узроўню вады ў рэках і інш.) і прагнозамі яго змен.

Прагнозы складаюцца на падставе аналізу картаў надвор'я, што перадаюцца па факсімільнай сувязі з Гідраметцэнтра СССР (Масква), і паведамляюцца па радыё і тэлебачанні, друкуюцца ў газетах. Б. н. складае карты больш буйнога маштабу, звесткі для якіх збіраюцца па радыё і тэлеграфе з метэастанцый і пастоў Еўрап. ч. СССР і Зах. Еўропы. Першае ў Расіі Б. н. створана ў 1872 у Пецярбургае, на Беларусі — у 1931 у Мінску. Мінскае Б. н. ў 1969 перайменавана ў бюро гідраметэаралагічных прагнозаў абслугоўвання нар. гаспадаркі.

БЮРО ПА НЕЛЕГАЛЬНАЙ РАБОЦЕ пры ЦК Кампартыі (бальшавікоў) Літвы і Беларусі, орган аператыўнага кіраўніцтва дзейнасцю падпольных парт. арганізацый на акупаванай польскімі інтэрвентамі тэр. Літоўска-Беларускай ССР. Створана ЦК КП(б)ЛіБ 3.9.1919, узгоднена з Цэнтр. Выканаўчым Бюро Камуніст. рабочай партыі Польшчы (ЦВБ КПРП) і зацверджана ЦК РКП(б). Чл. бюро: В. С. *Міцкявічус-Капсукас* (старшыня), В. Г. *Кнорын*, В. А. *Багуцкі*, пазней З. І. *Ангарэціс*. Кіравалася дырэктывамі ЦК РКП(б), ЦК КП(б)ЛіБ, у пытаннях, якія датычылі Польшчы,— дырэктывамі ЦВБ КПРП.

Бюро пасылала ў варожы тыл арганізатараў парт. падполля і партыз. руху, а таксама паліт. л-ру: творы У. І. Леніна, лістоўкі, адозвы, бальшавіцкія газеты на рус., бел., польск. і літ. мовах [«Правда», «Звезда», «Савецкая Беларусь», «Mlot» («Молат»), «Komunista» («Камуніст»), «Komunistas» («Камуніст»)]. У прыфрантавых г. Рэжыцы, Полацку, Рагачове, Крупках і Мазыры былі створаны транспартыровачныя пункты, у Бабруйску і Дзвінску — нелегальныя склады. З Рэжыцы і Дзвінска л-ра ішла ў тарыбскую Літву, з Полацка — у Вільню, з Рагачова — у Бабруйск і Мінск, з Крупак — у Мінск (праз Беразіно), Вільню (праз Глыбокае і Свір), Варысаў, Ігумен; з Мазыра — у Слуцк, Брэст, Мінск, Гродна. На ўсёй акупаванай тэр. дзейнічалі падпольныя парт. арг-цыі, партыз. атрады. Вялася растлумачальная работа сярод польскіх салдатаў. Бюро існавала да вер. 1920.

Літ.: Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919—1920), Мн., 1962. *Я. Н. Шкляр.* Мінск.

БЮРО ПАРТЫІНАЕ, выбарны выканаўчы орган, які кіруе штодзённай работай парт. арганізацыі. Паводле Статута КПСС бюро выбіраюць парт. арганізацыі, у якіх не менш за 15 чл., для выканання работы паміж сходамі; раённыя, гарадскія, акруговыя, абласныя, краявыя к-ты і ЦК кампартый саюзных рэспублік выбіраюць бюро для кіраўніцтва работай партарганізацый паміж пленумамі. ЦК КПСС для кіраўніцтва работай партыі паміж пленумамі ЦК выбірае Палітбюро, для бягучай работы — Сакратарыят. Б. п.— орган калегіяльнага кіраўніцтва. Гл. *Статут КПСС*.

БЮРО ЦК КПБ, кіруючы орган Камуністычнай партыі Беларусі з VIII з'езду КП(б)Б (12—14.5.1924), які выбіраецца пленумам ЦК КПБ для кіраўніцтва парт. і паліт. работай, гасп. і культ. будаўніцтвам у рэспубліцы паміж пленумамі ЦК. Да VIII з'езду КП(б)Б кіруючымі парт. органамі Кампартыі рэспублікі былі: *Цэнтральнае Бюро КП(б)Б* і яго Прэзідыум (31.12.1918 — 4.3.1919); *Цэнтральны Камітэт КП(б) Літвы і Беларусі* і яго Аргбюро, Палітбюро і Бюро па нелегальнай рабоце (4.3.1919 — вер. 1920); Цэнтральнае Бюро КП(б)Б, яго Сакратарыят і Прэзідыум (вер. 1920—8.2.1924); *Часовае Беларускае Бюро ЦК РКП(б)* і яго Прэзідыум (8.2.1924—12.5.1924). VIII з'езд КП(б)Б выбраў ЦК КП(б)Б (гл. *Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі*), які на першым пленуме 15.5.1924 выбраў Бюро ЦК КП(б)Б. Створаны орган існаваў да 1962. На аснове рашэння ліст. Пленума ЦК КПСС (1962) пленум ЦК КПБ 18.12.1962 замест Бюро ЦК КПБ стварыў Прэзідыум ЦК КПБ (гл. таксама *Сакратарыят ЦК КПБ*) і 2 галіновыя Бюро: Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва прамысл. і буд-вам. На аснове рашэння ліст. Пленума ЦК КПСС (1964) пленум ЦК КПБ 24.11.1964 скасаваў галіновыя Бюро. Пленум ЦК КПБ, які адбыўся 24—25.6.1966, перайменаваў Прэзідыум ЦК КПБ у Бюро ЦК КПБ.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж VIII—IX з'ездамі КП(б)Б (15.5.1924—8.12.1925). На пленуме ЦК КП(б)Б 15.5.1924 чл. Бюро выбраны: Я. А. Адамовіч, А. М. Асаткін-Уладзімірскі (сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 29.9.1924), В. У. Дзянаў, П. Д. Мядзведзь, В. П. Трунтаеў, Ш. Ш. Ходаш, А. Р. Чарвякоў. Пленум ЦК КП(б)Б 6—9.7.1924 выбраў канд. ў чл. Бюро А. Я. Калініна, Я. А. Левіна, І. І. Матусевіча. Пленум ЦК КП(б)Б 27—29.9.1924 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкага. Пленум ЦК КП(б)Б 11—14.11.1924 выбраў чл. Бюро У. М. Ігнатоўскага. Пленум ЦК КП(б)Б 2—8.5.1925 пастанавіў павялічыць колькасць чл. Бюро да 9 чал., выбраў дадаткова чл. Бюро С. М. Гесена, М. Е. Ендакова.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж IX—X з'ездамі КП(б)Б (12.12.1925—3.1.1927). На пленуме ЦК КП(б)Б 12.12.1925 чл. Бюро выбраны: Я. А. Адамовіч, П. А. Барушка, М. М. Галадзед (другі сакратар ЦК КП(б)Б), С. М. Гесен (да 27.7.1926), М. Е. Ендакоў, У. М. Ігнатоўскі, А. Я. Калянін, М. М. Карклін, А. І. Крыніцкі (першы сакратар ЦК КП(б)Б), Р. А. Пілляр, А. Р. Чарвякоў; канд. ў чл. Бюро: А. Р. Бейлін, У. А. Валынскі, Кавалеров (да 9.10.1926). Ю. К. Румянцаў (да 9.10.1926). Пленум ЦК КП(б)Б 27—29.4.1926 пастанавіў павялічыць колькасць чл. Бюро да 13, пакінуць канд. ў чл. Бюро 3 чал., дадаткова выбраў чл. Бюро А. Р. Бейліна, У. А. Валынскага, канд. ў чл. Бюро А. С. Славінскага. Пленум ЦК КП(б)Б 22—27.7.1926 выбраў чл. Бюро М. П. Абрамчука. Пленум ЦК КП(б)Б 5—9.10.1926 выбраў канд. ў чл. Бюро М. А. Акуліка, М. Ф. Муратаву.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж X—XI з'ездамі КП(б)Б (10.1.1927—22.11.1927). На пленуме ЦК КП(б)Б 10.1.1927 чл. Бюро выбраны: М. П. Абрамчук, Я. А. Адамовіч (да 5.5.1927), П. А. Барушка, А. Р. Бейлін, М. М. Галадзед (другі сакратар ЦК КП(б)Б да 5.5.1927), Н. Г. Гурэвіч, У. М. Ігнатоўскі, М. М. Карклін, А. І. Крыніцкі (першы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 5.5.1927), Я. М. Перапечка, Р. А. Пілляр, І. П. Рыжоў, А. Р. Чарвякоў; канд. ў чл. Бюро: М. А. Акулік, В. Р. Гантман, І. А. Іваноў, М. Ф. Муратава, А. С. Славінскі, К. Х. Супрун. Пленум ЦК КП(б)Б 1—5.3.1927 выбраў канд. у чл. Бюро М. С. Малашонка. Пленум ЦК КП(б)Б 4—5.5.1927 выбраў чл. Бюро і першым сакратаром ЦК КП(б)Б В. Г. Кнорына. Пленум ЦК КП(б)Б 26—30.9.1927 выбраў чл. Бюро і другім сакратаром ЦК КП(б)Б І. А. Васілевіча.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XI—XII з'ездамі КП(б)Б (29.11.1927—5.2.1929). На пленуме ЦК КП(б)Б 29.11.1927 чл. Бюро выбраны: М. П. Абрамчук (да 11.9.1928), П. А. Барушка, А. Р. Бейлін, І. А. Васілевіч (другі сакратар ЦК), М. М. Галадзед, Н. Г. Гурэвіч (да 11.9.1928), У. М. Ігнатоўскі, М. М. Карклін, В. Г. Кнорын (першы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 10.10.1928), Я. М. Перапечка (да 11.9.1928), Р. А. Пілляр, І. П. Рыжоў, А. Р. Чарвякоў; канд. ў чл. Бюро: М. А. Акулік (да 11.9.1928), В. Р. Гантман, І. А. Іваноў, М. М. Лапда (да 11.9.1928), М. С. Малашонак, А. С. Славінскі. Пленум ЦК КП(б)Б 8—11.9.1928 выбраў чл. Бюро: В. Р. Гантмана, А. С. Славінскага, Б. І. Стасевіча; канд. ў чл. Бюро: С. В. Карпа, А. П. Крохмаля, П. Д. Малаковіча, Дз. Ф. Прышчэпава, А. А. Сянкевіча. Пленум ЦК КП(б)Б 28.11—1.12.1928 выбраў чл. Бюро і першым сакратаром ЦК Я. В. Гамарніка.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XII—XIII з'ездамі КП(б)Б (16.2.1929—30.5.1930). На пленуме ЦК КП(б)Б 16.2.1929 чл. Бюро выбраны: А. Р. Бейлін (да 8.1.1930), І. А. Васілевіч (другі сакратар ЦК), М. М. Галадзед, Я. В. Гамарнік (першы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 5.11.1929), В. Р. Гантман, У. М. Ігнатоўскі, М. М. Карклін (да 8.1.1930), Р. А. Пілляр (да 8.1.1930), І. П. Рыжоў, І. Г. Самойлаў, А. С. Славінскі, Б. І. Стасевіч (да 8.9.1929), А. Р. Чарвякоў; канд. ў чл. Бюро: Л. Н. Араншцам (да 8.1.1930), І. А. Іваноў, П. Д. Малаковіч, А. А. Сянкевіч, А. І. Хацкевіч. Пленум ЦК КП(б)Б 5—8.9.1929 выбраў чл. Бюро: Р. П. Грысевіча, С. М. Кажэўнікава; канд. ў чл. Бюро П. М. Рачыцкага. Пленум ЦК КП(б)Б 3—8.1.1930 выбраў чл. Бюро і першым сакратаром ЦК К. В. Гей, чл. Бюро Л. Н. Араншцама, К. Ф. Бенека, кааптаваў у чл. ЦК КП(б)Б Р. Я. Рапапорта і выбраў яго чл. Бюро. Пленум ЦК КП(б)Б 27—30.3.1930 выбраў канд. у чл. Бюро Р. І. Хлеўнікава.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XIII—XIV з'ездамі КП(б)Б (12.6.1930—23.1.1932). На пленуме ЦК КП(б)Б 12.6.1930 чл. Бюро выбраны: Л. Н. Араншцам, К. Ф. Бенек, І. А. Васілевіч (другі сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 25.10.1930), С. М. Вароніч, М. М. Галадзед, В. Р. Гантман, К. В. Гей (першы сакратар ЦК КП(б)Б), Р. П. Грысевіч, У. М. Ігнатоўскі (да 25.10.1930), Р. Я. Рапапорт, П. М. Рачыцкі, І. П. Рыжоў, А. С. Славінскі, А. А. Сянкевіч (да 26.1.1931), А. Р. Чарвякоў; канд. ў чл. Бюро: С. Р. Міцькоў, А. І. Хацкевіч, Р. І. Хлеўнікаў, Г. Я. Чычэрай. Пленум ЦК КП(б)Б 20—25.10.1930 выбраў чл. Бюро С. І. Будзінскага, Р. І. Хлеўнікава, выбраў чл. Бюро і другім сакратаром ЦК В. Ф. Шаранговіча. Пленум ЦК КП(б)Б 20—26.1.1931 выбраў чл. Бюро З. З. Кавальчука, Дз. С. Чарнушэвіча. Пленум ЦК КП(б)Б 10—12.4.1931 выбраў чл. Бюро Радзенса. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б 12—16.11.1931 выбраў чл. Бюро Г. П. Матсона, І. П. Убарэвіча.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XIV—XV з'ездамі КП(б)Б (29.1.1932—16.1.1934). На пленуме ЦК КП(б)Б 29.1.1932 чл. Бюро выбраны: Л. Н. Араншцам (да 6.12.1933), К. Ф. Бенек, М. М. Галадзед, В. Р. Гантман (да 5.7.1932), М. Ф. Гікала (першы сакратар ЦК КП(б)Б), Р. П. Грысевіч, І. А. Іваноў (сакратар ЦК КП(б)Б па транспарце і чл. Бюро ЦК да 6.12.1933), З. З. Кавальчук, Г. П. Матсон (да 5.7.1932), П. М. Рачыцкі (да 23.7.1933), І. П. Рыжоў (да 5.7.1932), А. В. Рыскін (сакратар ЦК КП(б)Б па забеспячэнні), І. П. Убарэвіч, Р. І. Хлеўнікаў (да 5.12.1932), А. Р. Чарвякоў, Дз. С. Чарнушэвіч, В. Ф. Шаранговіч (другі сакратар ЦК); канд. ў чл. Бюро: С. Р. Міцькоў (да 5.12.1932), А. С. Судакоў (да 23.7.1933). А. І. Хацкевіч. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б 26—28.3.1932 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК В. Ю. Жаброўскага. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б 2—5.7.1932 выбраў чл. Бюро Л. М. Закоўскага і А. С. Картукова; канд. ў чл. Бюро Л. Б. Герцовіча. На пленуме ЦК КП(б)Б 1—5.12.1932 выбраны чл. Бюро: С. Р. Міцькоў (да 23.7.1933) і Я. В. Шафарэнка; канд. ў чл. Бюро: Р. Н. Брагінскі, П. В. Горын, М. А. Лялькоў. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б 20—23.7.1933 выбраў чл. Бюро К. К. Ратнека, канд. ў чл. Бюро І. Г. Жураўлёва. Пленум ЦК КП(б)Б 3—6.12.1933 кааптаваў у чл. Бюро П. А. Смірнова.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XV—XVI з'ездамі КП(б)Б (22.1.1934—10.6.1937). На пленуме ЦК КП(б)Б 22.1.1934 чл. Бюро выбраны: К. Ф. Бенек, М. М. Галадзед, М. Ф. Гікала (першы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 30.1.1937), В. Ю. Жаброўскі (да 1.3.1934), Л. М. Закоўскі, З. З. Кавальчук (з 1.3.1934 канд. ў чл. Бюро), А. С. Картукоў, І. А. Лычоў (да 1.3.1934), К. К. Ратнек, А. Б. Рыскін, П. А. Смірноў, І. П. Убарэвіч, А. Р. Чарвякоў, Дз. С. Чарнушэвіч (да 1.3.1934), В. Ф. Шаранговіч (другі сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 1.3.1934). Я. В. Шафарэнка (да 1.3.1934); канд. ў чл. Бюро: Р. Н. Брагінскі (да 1.3.1934), П. В. Горын, Л. Б. Герцовіч, І. Г. Жураўлёў (да 1.3.1934), Д. Ю. Конік (да 1.3.1934), А. М. Сакаян (з 1.3.1934 чл. Бюро), А. І. Хацкевіч (да 1.3.1934). Пленум ЦК КП(б)Б 28.2—1.3.1934 у адпаведнасці са Статутам ВКП(б) зацвердзіў пастанову Бюро аб скарачэнні колькасці чл. і канд. у чл. Бюро. Пленум зацвердзіў Бюро ЦК КП(б)Б з 11 чал. Члены: К. Ф. Бенек (да 30.5.1937), М. М. Галадзед, М. Ф. Гікала, Л. М. Закоўскі (да 10.12.1934), А. С. Картукоў, К. К. Ратнек (да 7.4.1935), А. Б. Рыскін, А. М. Сакаян (да 30.1.1937), П. А. Смірноў (да 17.1.1936), І. П. Убарэвіч (да 30.5.1937), А. Р. Чарвякоў. Кандыдаты: П. В. Горын (да 17.1.1936), Л. Б. Герцовіч, З. З. Кавальчук (да 26.9.1936). Пленум ЦК КП(б)Б 3. 8. 1934 выбраў чл. Бюро і другім сакратаром ЦК Д. І. Валковіча. На пленуме 9 — 10.12.1934 выбраны чл. Бюро І. М. Ляплеўскі (да 30.1.1937). На пленуме ЦК КП(б)Б 6—7.4.1935 выбраны канд. ў чл. Бюро: І. Ф. Кудзелька, М. К. Стэрнін (да 26.9.1936), Дз. С. Чарнушэвіч (да 17.1.1936). Пленум ЦК КП(б)Б 14—17.1.1936 кааптаваў у чл. Бюро ЦК А. С. Буліна, канд. ў чл. Бюро М. Л. Арабея (да 24.6.1936). І. З. Сурту, П. І. Хадасевіча. На пленуме ЦК КП(б)Б 30.1.1937 выбраны чл. Бюро: Г. А. Малчанаў (да 30.5.1937), І. З. Сурта; канд. ў чл. Бюро: А. В. Аўгустайніс, Л. А. Готфрыд, Р. М. Рубінштэйн. Пленум ЦК КП(б)Б 14—18.3.1937 выбраў чл. Бюро і першым сакратаром ЦК В. Ф. Шаранговіча.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XVI—XVII з'ездамі КП(б)Б (20.6.1937—10.6.1938). На пленуме ЦК

КП(б)Б 20.6.1937 чл. Бюро выбраны: В. Д. Берман, І. П. Бялоў (да 31.1.1938), Д. І. Валковіч (да 25.10.1937), А. А. Варончанка (да 25.10.1937), М. М. Дзеніскевіч (другі сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 29.7.1937), І. Г. Жураўлёў (да 25.10.1937), А. І. Мезіс (да 31.1.1938), М. Ф. Нізаўцоў (да 29.7.1937), У. Дз. Патапейка (трэці сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 25.10.1937), М. В. Стакун, В. Ф. Шаранговіч (першы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б да 29.7.1937); канд. ў чл. Бюро: А. В. Аўгустайніс (да 25.10.1937), Ф. М. Вайновіч (да 25.10.1937), Л. А. Готфрыд (да 25.10.1937), Н. І. Літвін (да 25.10.1937), Р. М. Рубінштэйн (да 7.7.1937), І. З. Сурта (да 25.10.1937), Дз. В. Юркоў. На пленуме ЦК КП(б)Б 25.10.1937 выбраны чл. Бюро: А. А. Ананьеў, А. Ф. Цвяткоў; канд. ў чл. Бюро: І. А. Жабраў (да 9.6.1938). На пленуме ЦК КП(б)Б 30—31.1.1938 выбраны чл. Бюро: А. А. Волкаў (в. а. першага сакратара ЦК КП(б)Б з 11.8.1937), П. І. Голікаў, А. Ф. Кавалёў, А. М. Лявіцкі (в. а. другога сакратара ЦК КП(б)Б з 11.8.1937), Н. Я. Наталевіч, М. Я. Рапінскі (трэці сакратар ЦК КП(б)Б з 25.10.1937).

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XVII—XVIII з'ездамі КП(б)Б (19.6.1938—15.5.1940). На пленуме ЦК КП(б)Б 19.6.1938 чл. Бюро выбраны: А. А. Ананьеў (другі сакратар і чл. Бюро ЦК да 4.10.1938); П. І. Голікаў (да 4.10.1938), А. Ф. Кавалёў (да 4.10.1938), М. П. Кавалёў, А. М. Лявіцкі, А. А. Насёдкін (да 27.1.1939), Н. Я. Наталевіч, П. К. Панамарэнка (першы сакратар ЦК), М. Я. Рапінскі (да 27.1.1939); канд. ў чл. Бюро: І. Д. Кавалькоў (да 27.1.1939), Дз. Ф. Маркін, А. П. Мацвееў, Т. І. Якушава (да 27.1.1939). Пленум ЦК КП(б)Б 25.7.1938 выбраў чл. Бюро Н. Р. Грэкаву (трэці сакратар ЦК). Пленум ЦК КП(б)Б 2—4.10.1938 выбраў чл. Бюро К. В. Кісялёва, А. П. Мацвеева. Пленум ЦК КП(б)Б 25—27.1.1939 выбраў чл. Бюро М. В. Кулагіна (другі сакратар ЦК з 16.11.1939), канд. у чл. Бюро І. І. Масленікава. Пленум ЦК КП(б)Б 15—16.11.1939 выбраў чл. Бюро Л. Ф. Цанаву.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XVIII—XIX з'ездамі КП(б)Б (20.5.1940—15.2.1949). На пленуме ЦК КП(б)Б 20.5.1940 чл. Бюро выбраны: Н. Р. Грэкава (трэці сакратар і чл. Бюро ЦК да 20.12.1940), К. В. Кісялёў (да 20.12.1940), Ф. І. Кузняцоў (да 20.12.1940), М. В. Кулагін (другі сакратар і чл. Бюро ЦК да 22.6.1941), У. Н. Малін (сакратар ЦК па прапагандзе і агітацыі з 6.6.1939, сакратар ЦК па прамысл. з 8.3.1941, трэці сакратар ЦК з 26.8.1943, сакратар ЦК па прамысл. з 7.3.1947 да 1.12.1947; член Бюро да 1.12.1947), А. П. Мацвееў, Н. Я. Наталевіч, П. К. Панамарэнка (першы сакратар ЦК да 7.3.1947), Л. Ф. Цанава; канд. ў чл. Бюро: Р. М. Байкачоў (сакратар ЦК па кадрах з 16.11.1939 да 20.12.1940, канд. у чл. Бюро да 20.12.1940), В. Я. Галоўкін (да 20.12.1940); І. А. Крупеня (да 20.12.1940), Р. Б. Эйдзінаў (чл. Бюро і трэці сакратар ЦК з 20.12.1940, сакратар ЦК па авіяц. прамысл. з 26.3.1941 да 1.9.1943). На пленуме ЦК КП(б)Б 27—28.6.1940 выбраны чл. Бюро І. С. Былінскі (да 16.2.1947). На пленуме ЦК КП(б)Б 20—22.12.1940 выбраны чл. Бюро І. А. Крупеня (да 16.3.1948), Р. Б. Эйдзінаў (да 6.6.1947); канд. ў чл. Бюро: К. І. Бударын, У. Р. Ванееў (трэці сакратар і чл. Бюро ЦК з 26.3.1941 да пач. Айч. вайны). 22.6.1941 уведзены ў склад членаў Бюро ЦК П. З. Калінін (другі сакратар ЦК да 13.9.1944). На пленуме 12—18.2.1945 выбраны чл. Бюро: Ц. С. Гарбуноў (сакратар ЦК па прапагандзе і агітацыі з 26.3.1941 да 16.2.1947, чл. Бюро да 16.2.1947), М. В. Кісялёў (другі сакратар ЦК з 13.9.1944 да 7.3.1947, чл. Бюро да 6.6.1947), В. І. Казлоў, П. А. Лявіцкі (да 6.6.1947); канд. ў чл. Бюро: М. Я. Аўхімовіч (сакратар ЦК па кадрах з 20.12.1940 да 6.6.1947, канд. у чл. Бюро да 6.6.1947), М. В. Зімянін (да 6.6.1947). На пленуме ЦК КП(б)Б 15—16.2.1947 выбраны чл. Бюро: К. В. Кісялёў, У. Г. Кудраеў (да 6.6.1947). Пленум ЦК КП(б)Б 7.3.1947 выбраў чл. Бюро: М. І. Гусарава (першы сакратар ЦК), С. Дз. Ігнацьева (сакратар ЦК па с. гасп. і нарыхтоўках), М. Т. Іаўчука (сакратар ЦК па прапагандзе і агітацыі). Пленум ЦК КП(б)Б 3—6.6.1947 выбраў чл. Бюро: М. В. Зімяніна (сакратар ЦК па кадрах), С. Г. Трафіменку. Пленум ЦК КП(б)Б 27.11—1.12.1947 выбраў чл. Бюро: І. М. Макарава, І. П. Тура (сакратар ЦК па чыг. транспарце з 26.3.1941 да верасня 1941; сакратар ЦК па прамысл. з 1.12.1947). Пленум ЦК КП(б)Б 1—3.12.1948 выбраў чл. Бюро А. Я. Кляшчова.

Бюро ЦК КП(б)Б паміж XIX—XX з'ездамі КП(б)Б (19.2.1949—20.9.1952). На пленуме ЦК КП(б)Б 19.2.1949 чл. Бюро выбраны: М. І. Гусараў (першы сакратар і чл. Бюро ЦК да 3.6.1950), В. І. Закурдаеў (сакратар і чл. Бюро ЦК да 3.6.1950), М. В. Зімянін (другі сакратар ЦК), А. Я. Кляшчоў, В. І. Казлоў, У. А. Тамашэвіч (сакратар і чл. Бюро ЦК да 3.6.1950), С. Г. Трафіменка (да 11.6.1949), Л. Ф. Цанава, В. Я. Чарнышоў (сакратар ЦК з 3.6.1950 да 10.6.1951, чл. Бюро да 10.6.1951); канд. ў чл. Бюро: П. А. Абрасімаў (да 3.6.1950), П. М. Брэнч (сакратар і канд. у чл. Бюро ЦК да 3.6.1950), П. З. Калінін, П. М. Машэраў. Пленум ЦК КП(б)Б 9—11.6.1949 выбраў чл. ЦК і чл. Бюро С. К. Цімашэнку. Пленум ЦК КП(б)Б 31.5—3.6;5.7.1950 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК П. А. Абрасімава, чл. Бюро І. П. Ганенку (сакратар ЦК па буд-ве з 26.3.1941, да 1.9.1943, сакратар ЦК з 3.6.1950), чл. Бюро і сакратаром ЦК Ц. С. Гарбунова, чл. Бюро і першым сакратаром ЦК КП(б)Б М. С. Патолічава.

Бюро ЦК КПБ паміж XX—XXI з'ездамі КПБ (24.9.1952—10.2.1954). На пленуме ЦК КП(б)Б 24.9.1952 чл. Бюро выбраны: П. А. Абрасімаў, М. І. Баскакаў (да 27.6.1953), Ц. С. Гарбуноў (сакратар ЦК), М. В. Зімянін (другі сакратар і чл. Бюро ЦК да 24.7.1953), А. Я. Кляшчоў (да 24.7.1953), В. І. Казлоў, К. Т. Мазураў, М. С. Патолічаў (першы сакратар ЦК), С. К. Цімашэнка; канд. ў чл. Бюро: І. М. Макараў, П. М. Машэраў. Пленум ЦК КПБ 25—27.6.1953 выбраў чл. Бюро і другім сакратаром ЦК М. Я. Аўхімовіча, чл. Бюро М. Ф. Дзячко. Пленум ЦК КПБ 24.7.1953 выбраў чл. Бюро М. І. Баскакава, І. Ф. Клімава.

Бюро ЦК КПБ паміж XXI—XXII з'ездамі КПБ (13.2.1954—24.1.1956). На пленуме ЦК КПБ 13.2.1954 чл. Бюро выбраны: П. А. Абрасімаў, М. Я. Аўхімовіч (другі сакратар ЦК), М. І. Баскакаў, Ц. С. Гарбуноў (сакратар ЦК), В. І. Казлоў, І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў, М. С. Патолічаў (першы сакратар ЦК), С. К. Цімашэнка; канд. ў чл. Бюро: Л. І. Лубеннікаў, І. М. Макараў, П. М. Машэраў. Пленум ЦК КПБ 29.7.1955 выбраў чл. Бюро ЦК Ц. Я. Кісялёва (сакратар ЦК).

Бюро ЦК КПБ паміж XXII—XXIV з'ездамі КПБ (27.1.1956—17.2.1960). На пленуме ЦК КПБ 27.1.1956 чл. Бюро выбраны: П. А. Абрасімаў (сакратар і чл. Бюро ЦК да 8.1.1957), М. Я. Аўхімовіч (другі сакратар ЦК да 28.7.1956, чл. Бюро да 9.4.1959), М. І. Баскакаў (да 11.4.1958), Ц. С. Гарбуноў (сакратар і чл. Бюро ЦК да 9.1.1960), В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў (сакратар ЦК да 28.7.1956, другі сакратар да 9.4.1959), І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў (першы сакратар ЦК з 28.7.1956), І. М. Макараў, М. С. Патолічаў (першы сакратар і чл. Бюро ЦК да 28.7.1956), С. К. Цімашэнка; канд. ў чл. Бюро: А. Н. Аксёнаў, Ф. А. Сурганаў. Пленум ЦК КПБ 6—7.12.1956 выбраў чл. Бюро Ф. А. Сурганава (з 28.7.1956 сакратар, з 9.4.1959 другі сакратар ЦК КПБ). Пленум ЦК КПБ 8.1.1957 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК А. І. Залава (сакратар да 4.12.1957). Пленум ЦК КПБ 3—4.12.1957 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК Дз. Ф. Філімонава. Пленум ЦК КПБ 9.4.1959 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК П. М. Машэрава. Пленум ЦК КПБ 9.1.1960 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК В. Ф. Шауру.

Бюро ЦК КПБ паміж XXIV—XXV з'ездамі КПБ (19.2.1960—26.9.1961). На пленуме ЦК КПБ 19.2.1960 чл. Бюро выбраны: А. І. Залаў, В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў, І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў (першы сакратар ЦК), І. М. Макараў, П. М. Машэраў (сакратар ЦК), Ф. А. Сурганаў (другі сакратар ЦК), Дз. Ф. Філімонаў (сакратар ЦК), С. К. Цімашэнка (да 9.7.1960), В. Ф. Шаура (сакратар ЦК); канд. ў чл. Бюро: Л. Г. Максімаў, С. В. Прытыцкі. Пленум ЦК КПБ 8—9.7.1960 выбраў чл. Бюро С. В. Прытыцкага.

Бюро ЦК КПБ паміж XXV—XXVI з'ездамі КПБ (28.9.1961—3.3.1966). На пленуме ЦК КПБ 28.9.1961 чл. Бюро выбраны: А. І. Залаў, В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў, І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў (першы сакратар ЦК да 30.3.1965), І. М. Макараў, П. М. Машэраў (сакратар, з 18.12.1962 другі сакратар, з 30.3.1965 першы сакратар ЦК КПБ), Дз. Ф. Філімонаў (сакратар ЦК), В. Ф. Шаура (сакратар ЦК да 24.12.1965); канд. ў чл. Бюро: Л. Г. Максімаў, В. А. Плыкоўскі, С. А. Пілатовіч (сакратар ЦК КПБ з 24.12.1965). Пленум ЦК КПБ 12—13.6.1962 выбраў канд. у чл. Бюро У. Е. Лабанка. Пленум ЦК КПБ 18.12.1962 замест Бюро ЦК КПБ стварыў Прэзідыум ЦК КПБ і 2 галіновыя Бюро: Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва с. гасп. і Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва прамысл. і будаўніцтвам. Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва сельскай гасп.: У. Е. Лабанок, Ф. М. Пальгуеў, С. Г. Скарапанаў, Ф. А. Сурганаў (старшыня — сакратар ЦК КПБ), Г. А. Філіпаў (нам. старшыні). У сувязі з выбраннем Ф. А. Сурганава старшынёй Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва с. гасп. пленум вызваліў яго ад абавязкаў другога сакратара ЦК, выбраў сакратаром ЦК; другім сакратаром ЦК КПБ выбраны П. М. Машэраў. Пленум ЦК КПБ 5—6.7.1963 выбраў чл. Бюро для кіраўніцтва с. гасп. Г. М. Машкова, А. І. Ярэл. Пленум ЦК КПБ 10—11.1.1964 выбраў чл. Бюро С. М. Пуцылева. Бюро ЦК КПБ для кіраўніцтва прамысл. і будаўніцтвам: А. І. Золаў, А. А. Смірноў (нам. старшыні), Г. У. Семяніхін (да 6.7.1963), А. М. Тарасаў (да 6.7.1963), Дз. Ф. Філімонаў (старшыня — сакратар ЦК КПБ). Пленум ЦК КПБ 5—6.7.1963 выбраў чл. Бюро: У. Г. Каменскага, С. М. Кішкіна, Я. А. Мікуловіча, М. П. Тарасава. Пленум ЦК КПБ 10—11.1.1964 выбраў чл. Бюро У. В. Мацвеева, М. Ф. Мішчанку. Пленум ЦК КПБ 24.11.1964 скасаваў галіновыя Бюро. Пленум ЦК КПБ 24.6.1966 перайменаваў Прэзідыум ЦК КПБ у Бюро ЦК КПБ.

Бюро ЦК КПБ пасля чэрвеньскага (1966) пленума ЦК КПБ: члены — В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў, У. Е. Лабанок, І. М. Макараў, П. М. Машэраў (першы сакратар ЦК), І. Я. Палякоў, С. А. Пілатовіч (сакратар ЦК), С. В. Прытыцкі (сакратар ЦК да 23.1.1968), А. А. Смірноў (сакратар ЦК КПБ з 30.3.1965 да 24.12.1965 і з 18.6.1968), Ф. А. Сурганаў (другі сакратар ЦК), Дз. Ф. Філімонаў (сакратар і чл. Бюро ЦК да 18.6.1968); канд.— Г. М. Жабіцкі, С. С. Марахін (да 23.1.1968). Пленум ЦК КПБ 22—23.1.1968 выбраў чл. Бюро і сакратаром ЦК КПБ У. Ф. Мінкевіча, канд. у чл. Бюро М. Н. Полазава.

А. А. Кузняцоў. Мінск.

БЮРО ЦК КПСС ПА РСФСР, створана паводле пастановы ЦК КПСС ад 27.2.1956 з мэтай паляпшэння кіраўніцтва дзейнасцю рэспубліканскіх, краявых, абласных парт., сав. і гасп. органаў, аператыўнага вырашэння пытанняў гасп. і культ. будаўніцтва ў РСФСР. Абавязкі старшыні Бюро ЦК КПСС па РСФСР ускладаліся на Першага сакратара ЦК КПСС. XXIII з'езд КПСС (1966) прызнаў існаванне Бюро ЦК КПСС па РСФСР немэтаагодным і ліквідаваў яго.

БЮСТ (франц. buste), пагрудная выява чалавека, адзін з самых папулярных відаў скульптурнага партрэта. Вял. майстрам партрэтнага Б. быў рус. скульптар 18 ст. Ф. Шубін. У сав. час найб. значныя ўзоры партрэтнага Б. стварылі М. Андрэеў, В. Мухіна, Г. Галубкіна і інш. У бел. мастацтве вылучаюцца Б. работы З. Азгура, А. Грубэ, А. Бембеля, А. Анікейчыка і інш.

БЮФОН (Buffon) Жорж Луі Леклерк (7.9.1707—16.4.1788), французскі натураліст-матэрыяліст. Чл. Парыжскай АН (1733). Аўтар 36 тамоў «Натуральнай гісторыі» (1749—88). Развіваў прагрэс. ідэі пра адзінства жывёльнага і раслінnага свету. У процілегласць К. Лінею звярнуў увагу не на сістэматыку, а на апісанне і біялогію жывёл у натуральных умовах і выказаў думку пра змену відаў пад уплывам гэтых умоў. У працах па геалогіі («Тэорыя зямлі» і «Эпохі прыроды») абагульніў вядомы да яго фактычны матэрыял і прапанаваў тэорыю прыродна-гістар. развіцця зямлі.

Тв.: Histoire naturelle générale et particulière ..., v. 1—44, Paris, 1749—1804.

БЮХНЕР (Büchner) Георг (17.10.1813, Годэлаў — 19.2.1837), нямецкі драматург. Сын урача. З 1834 актыўны ўдзельнік нелегальнага рэвалюц. «Таварыства правоў чалавека», якое мела на мэце вызваленне сялянства з-пад феад. прыгнёту. У цэнтры рэаліст. драмы Б. «Смерць Дантона» — праблема ролі пар. мас у гісторыі. Аўтар сатыр. камедыі «Леонс і Лена» і драмы «Войцэк», дзе выкрываюцца сац. заганы феад. гр-ва.

Тв.: Рус. пер. — Соч., М. — Л., 1935.


БЯГАНСКАЯ Ядвіга Іосіфаўна [н. 16(29).2.1908, Улан-Удэ], беларуская савецкая пісьменніца. З сям'і чыгуначніка. У 1922 з бацькамі пераехала ў Мінск. Скончыла літ. аддз. пед. ф-та БДУ (1930). У 1930—37 выкладала беларускую мову і л-ру ў школах Мінска. Настаўнічала на Поўначы. Працавала рэд. радыёперадач для дзяцей і юнацтва Беларускага радыё (1956—64). Друкуецца з 1926. Выдала кн. для дзяцей «Далёка на Поўначы» (1954), «Жэнеў галубок» (1958), «Сустрэча з морам» (1962), «Зосіна зорачка» (1965). Пераклала на бел. мову са славацкай раманы М. Крно «Я вярнуся жывы» (1960), з польскай — аповесці Б. Ясенскага «Палю Парыж» (1932), Г. Мушынскай-Гофман «Вера і яе таварышы» (пра В. Харужую, 1965), Я. Корчака «Кароль Мацюс Першы» (1970) і інш.

Тв.: Кожны марыць стаць Калумбам, Мн., 1968.

БЯГОМЛЬ, гар. пасёлак (з 1938) у Докшыцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Бягомльскі». У 1924—60 цэнтр Бягомльскага р-на. За 30 *км* на ПдУ ад Докшыц, 162 *км* ад Віцебска, 42 *км* ад чыг. ст. Параф'янава. Вузел шашэйных дарог на Мінск, Віцебск, Барысаў, Докшыцы. 2950 ж. (1970).

У Вял. Айч. вайну — асяродак партыз. руху. У снеж. 1942 *партызанская брыгада «Жалязняк»* знішчыла бягомльскі ням. гарнізон. З таго часу да прыходу Сав. Арміі ў Б. дзейнічалі органы Сав. улады, выдавалася газета «Савецкі патрыёт» — орган Бягомльскага райкома КП(б)Б. Тут базіравалася вялікае партыз. злучэнне паўн. раёнаў Мінскай вобл. Фаш. авіяцыя амаль поўнасцю знішчыла Б. 30.5.1943 карная экспедыцыя расстраляла і спаліла жывымі больш за 300 жыхароў гар. пасёлка. У Б. доўгі час дзейнічаў партыз. аэрадром. Пасля вайны В. адбудаваны. Устаноўлены помнікі: У. І. Леніну ў скверы; на брацкай магіле партызанаў і сав. воінаў; мемарыяльная

Бягомль. Агульны выгляд.



пліта на ўшанаванне памяці закатаваных нямецкімі акупантамі жыхароў Б.; у гонар партыз. брыгады «Жалязняк», якая ўдзельнічала ў вызваленні Б.; абеліск на месцы аэрадрома ў гонар дружбы беларускіх і літоўскіх партызанаў. На Пн ад Б. гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі.

Прамкамбінат, майстэрні камбіната быт. абслугоўвання, участак Полацкага хімлясгаса, участак Плешчаніцкага леспрамгаса, лясгас. Сярэдняя школа, васьмігадовая школа-інтэрнат, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца. Музей народнай славы.

БЯГОНІЯ (Begonia), род адна- або шматгадовых травяністых і кустовых раслін сям. бягоніевых. Лісце косасэрцападобнае, нераўнабокае або прадаўгаватае авальназавостранае. Кветкі яркія, белыя, ружовыя або чырвоныя; ёсць махрыстыя (у гібрыдаў). Размнажаецца насеннем, чаранкамі і лісцем. Вядома больш за 800 відаў; дзіка расце ў лясах трапічных краін (акрамя Аўстраліі). У СССР Б. культывуецца як дэкаратыўная (у пакоях, аранжарэях, на клумбах і газонах). Найб. вядомыя віды: Б. заўсёды цвітучая (B. semperflorens), Б. рэкс (B. rex), Б. металічная (B. metallica), Б. зграбная (B. gracilis), Б. плямістая (B. maculata), Б. Вельтанензіс (B. Weltoniensis), Б. Крэднера (B. Credneri) і інш.



Бягонія рэкс.

Літ.: Многолетние цветы открытого грунта, М., 1959; Киселев Г. Е. Цветоводство, 3 изд., М., 1964.

БЯГУН Пётр Андрэевіч [н. 18.4(1.5).1907, в. Бардзілаўка Мінскага пав.], удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. З 1937 старшыня Суражскага райвыканкома, з 1939 дырэктар шклозавода «Нёман». З першых дзён Айч. вайны ў тыле ворага. З чэрв. 1943 упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і Бел. штаба партыз. руху ў паўд. раёнах Баранавіцкай вобл. З снеж. 1943 камісар *партызанскай брыгады імя М. В. Фрунзе* і сакратар Клецкага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вызвалення Беларусі ад фаш. захопнікаў на парт. і гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

БЯГУЧЫ РАМОНТ, адзін з відаў рамонту асн. фондаў, звязаны з эксплуатацыяй машын, апаратаў, будынкаў і рабочага абсталявання. Уваходзіць у сістэму планава-папераджальнага рамонту, папярэджвае заўчаснае зношванне, аварыі, прастоі абсталявання. Робіцца на сродкі вытв. прызначэння, затраты на Б. р. уключаюцца ў сабекошт прадукцыі.

БЯГУЧЫ РАХУНАК, форма бестэрміновага хавання грашовых сродкаў у банках і ашчадных касах, пры якой укладчык можа атрымліваць унесеныя грошы па меры патрэбы і папаўняць свой уклад дадатковымі ўзносамі. У капіталіст. краінах на Б. р. пераважна захоўваюцца часова свабодныя капіталы і касавыя рэзервы капіталістаў.

БЯДА Леанід Ігнатавіч (н. 16.8.1920, с. Нова-Пакроўка Кустанайскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945), ген.-м. авіяцыі (1960). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію (1950), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1957). У вайну на Сталінградскім, 4-м Укр. і 3-м Бел. франтах — лётчык-штурмавік. Удзельнік баёў пад Сталінградам, у Крыме, вызваленні Данбаса, Беларусі, ваяваў ва Усх. Прусіі, Германіі. За час вайны правёў 214 штурмавых удараў. Служыць у Сав. Арміі.

БЯДРЫНЕЦ (Pimpinella), род шматгадовых, радзей аднагадовых травяністых раслін сям. парасонавых. Сцябло прамастойнае, кароткаапушанае, усярэдзіне пустое, выш. 15—60 (100) *см*. Лісце няпарнаперыстае. Кветкі дробныя, белыя ці ружовыя. Суквецце — складаны парасон. Вядома каля 150 відаў у Еўропе, Азіі і Афрыцы. У СССР 26 відаў, у БССР 3, з якіх найб. вядомы Б. каменяломнікавы (P. saxifraga, нар. назвы: дзягель, едрынец, берджанец, пастарнак палявы). Расце на сухадольных лугах, узлесках, каля дарог; добрая кармавая расліна (дамешак Б. ў сена павышае надоі малака). Карані маюць эфірны алей, дубільныя рэчывы, сапаніны, гліказід пімпінелін. Насенне віду P. anisum выкарыстоўваецца як пахучая прыправа.



Бядрынец каменяломнікавы.

Літ.: Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

БЯДУЛЯ Змітрок (Ясакар, Сымон Пустэльнік, Іскра, Святагор, Ярыла Чырвоны; сапр. Плаўнік Самуіл Яфімавіч; 23.4.1886, мяст. Пасадзец Вілейскага пав. Віленскай губ.— 3.11.1941), беларускі савецкі пісьменнік. З сям'і ляўрэя-арандатара, які пасля стаў дробным лесапрамысловцам. Вучыўся ў хедары — пач. яўр. школе, ешыбоце — школе рабінаў. Працаваў хатнім настаўнікам, памагаў бацьку на лесараспрацоўках як прыказчык. Першы друкаваны твор на бел. мове — абразок у прозе «Пяюць начлежнікі» («Наша ніва», 1910, № 39). У гэтай газеце з'яўляюцца яго вершы і допісы. Адначасова друкуе вершы і празаічныя абразкі вытанчана-рамант. і ўпадніцкага зместу ў час. «На берегах Невы»







«Казкі» (Мінск, 1956). Вокладка. «Сярэбраная табакерка» (Мінск, 1958). Вокладка.

(Пецярбург) і «Молодые порывы» (Вільня). У канцы 1912 пераехаў у Вільню. Працуе ў выдавецкім т-ве, пасля сакратаром «Нашай нівы». У выд. «Загляне сонца і ў наша ваконца» выйшаў першы зб. Б. «Абразкі» (1913) — лірычныя мініяцюры ў прозе, у якіх бел. вёска і селянін паказваюцца ў рамант. асвятленні. Рысы нар. побыту паэтызуюцца, часта выглядаюць экзатычна. Незвычайны погляд на свет быў выяўленнем складанага, эмацыянальна-напружанага ўнутр. жыцця, уласцівага лірычнаму герою. Выразна выступаюць у зборніку матывы любові да роднага краю, востра асуджаецца сац. несправядлівасць. Некат. абразкі нагадвалі апавяданні, што сведчыла пра эвалюцыю пісьменніка да эпічнасці. Неўзабаве жанр апавядання стаў паўнапраўным у яго творчасці. Віленскі перыяд надзвычай плённы: Б. піша вершы, апавяданні, публіцыст. артыкулы, удзельнічае ў культ. і грамад. жыцці. У першых апавяданнях («Малітва малога Габрусіка», «Гармонік плакаў», «Шалёны») заўважаецца стылёвая сувязь з лірычнымі абразкамі, не пераадолены да канца аднабакова рамантычны погляд на жыццё. Апавяд. «Злодзей», «Сон Анупрэя», «Гора ўдавы Сымоніхі», «Пяць лыжак заціркі», «На каляды к сыну», «Летапісцы», «Малыя дрывасекі» і «Умарыўся» — значнае дасягненне рэаліст. майстэрства пісьменніка. Б. паказаў сац. ўціск бел. сялянства. Ён бачыў у народзе духоўную стойкасць, выспяванне пратэсту супраць прыгнёту, веру ў лепшую будучыню («Буслы»). У апавяданнях, дзе сцвярджаецца ідэя вызвалення, часта звяртаецца да алегар. іншасказу і ўмоўна-казачнага сюжэту («Панас на небе», 1914, апубл. 1923). Умацаванне рэаліст. метаду ў творчасці Б. садзейнічала развіццю яго эстэт. погляду. Ад услаўлення красы як абстрактнага ідэалу пераходзіць да заклікаў ісці ў гушчу жыцця, ствараць патрэбнае людзям сацыяльна значнае мастацтва (арт. «Трэба жыць з людзьмі», 1914). Імперыяліст. вайна ўмацніла ў яго творчасці матывы смутку, тугі і роспачы. Паяўляюцца вобразы апакаліпсічнага характару. У 1915, калі закрылася «Наша ніва», вярнуўся ў Пасадзец, адтуль неўзабаве пераехаў у Мінск. Працаваў у бел. бежанскім камітэце, удзельнічаў у нац.-культ. жыцці. Мэты і задачы Кастр. рэв. зразумеў не адразу. У перыяд грамадз. вайны, ням. і польскай акупацыі выказваў памылковыя паліт. погляды. У некат. артыкулах крытыкаваў палітыку акупац. улад. У творах таго часу пераважаюць песімістычныя настроі, ускладнёная вобразнасць, невыразныя імкненні. У апавяд. «Смерць пані» і «Бондар» зноў вярнуўся на рэаліст. пазіцыі, асуджаў паноў як эксплуататараў і душыцеляў нар. талентаў. Пасля ўстанаўлення Сав. улады адразу ўключыўся ў грамад. і культ. работу. Некалькі гадоў працаваў у газ. «Савецкая Беларусь», быў рэдактарам дзіцячага час. «Зоркі», краязнаўчага «Наш край». Першы паслярэвалюц. зб. «Пад родным небам» (1922). Паступова ў творчасці Б. ўзмацняюцца матывы, сугучныя новаму часу («Беларусь», 1923). Сярод нямногіх старэйшых пісьменнікаў быў прыняты ў літ. аб'яднанне «Маладняк», пасля перайшоў ва «Узвышша». У зб. «Буралом» (1925), «Паэмы» (1927) — рамант.-пафаснае ўслаўленне рэвалюц. эпохі. У фальклорна-рамант. аповесці «Салавей» (1927, экраніз. 1937; аднайм. балет, муз. М. Крошнера, 1939; інсцэніроўка паст. т-рам Я. Купалы, 1956) паказаў барацьбу бел. сялян з панамі ў часы прыгону. Аповесці «Год за годам» і «Таварыш Мінкін» (1930), апавяд. «Дэлегатка», «Тры крыжыкі», «Рунь», «Дзве ночы», «Свінарка Фрэйда», «Віхор» і інш.— пра сав. рэчаіснасць. У 1928—32 напісаў раман «Язэп Крушынскі». У першай яго кнізе па-майстэрску ўвасоблены складаныя працэсы грамадскага развіцця 20-х г. Другая не звязваецца арганічна з першай, яе ідэйна-маст. ўзровень нізкі: на пазіцыі пісьменніка адчуваецца моцны ўплыў некат. вульгарнасацыялаг. патрабаванняў тагачаснай крытыкі. Аўтабіягр. аповесці «Набліжэнне» (1935) і «У дрымучых лясах» (1939) каларытна перадаюць побыт бел. мястэчка напярэдадні імперыяліст. вайны. Апошні твор Б. «Сярэбраная табакерка», напісаны ў жанры казкі, мае складаны грамадска-філас. змест. Напісаў шмат твораў для дзяцей («Мурашка-Палашка», 1939, і інш.), даследаванне «Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных казках і песнях» (1924). Творы Б. перакл. на мовы народаў СССР і за мяжою. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Збор твораў, т. 1—4, Мн., 1951—53; Сярэбраная табакерка, Мн., 1958.

Літ.: Смолкін М. Змітрок Бядуля, Мн., 1961; Каваленка В. Пошукі і здзяйсненні, Мн., 1963; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 1, Мн., 1965; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969; Хведаровіч М. Памятныя сустрэчы, 2 выд., Мн., 1963, с. 61—85. *В. А. Каваленка.* Мінск.

БЯЗВАЖКАСЦЬ, стан цела, пры якім знешнія сілы і яго рух не выклікаюць у ім узаемнага ціску адных частак на другія. Узнікае пры наступных умовах: 1) на цела дзейнічаюць толькі масавыя сілы (напр., сіла цяжару) і не дзейнічаюць паверхневыя сі-


лы (напр., сіла рэакцыі апоры); 2) памеры цела не вельмі вялікія, таму ў кожны момант часу сіла цяжару ва ўсіх пунктах цела аднолькавая; 3) цела рухаецца паступальна. Гэтыя ўмовы рэалізуюцца, напр., у стане свабоднага падзення, у штучных спадарожніках Зямлі і касм. караблях, калі яны рухаюцца з выключанымі рухавікамі.

На цела, якое знаходзіцца ў гравітацыйным полі Зямлі па апоры (ці падвесе), дзейнічаюць вага цела і ў процілеглым напрамку сіла рэакцыі апоры (ці сіла націжэння падвеса), што вядзе да ўзнікнення ўзаемнага ціску адной часткі цела на другую. Такое статычнае выяўленне сілы цяжару вядзе да дэфармацыі і ўнутраных напружанняў у целе, якія чалавек успрымае як адчуванне ўласнай вагі (важкасці). У залежнасці ад умоў сіла рэакцыі апоры можа адрознівацца ад нармальнай вагі нерухомага цела на паверхні Зямлі. Напр., калі касм. карабель рэзка павялічвае скорасць, касманаўта прыціскае да крэсла сіла, у некалькі разоў большая за нармальную вагу, што ўспрымаецца як павелічэнне ўласнай вагі касманаўта (т. зв. перагрузка). У стане свабоднага падзення ці ў штучным спадарожніку Зямлі на цела дзейнічае толькі сіла цяжару, а інш. знешнія сілы, у т. л. і сілы рэакцыі апоры, адсутнічаюць. Такое дынамічнае выяўленне сілы цяжару не выклікае ўзаемнага ціску адной часткі цела на другую, узнікае Б., якую чалавек успрымае як страту вагі.

Касмічныя палёты сав. і амер. касманаўтаў паказалі, што знаходжанне чалавека ў стане Б. некалькі дзён не выклікае значных парушэнняў фізіял. дзейнасці арганізма. Каб пазбавіць касманаўтаў ад Б. ў час доўгіх касм. падарожжаў, мяркуецца ствараць штучную «вагу», ролю якой будуць адыгрываць магнітныя сілы або цэнтрабежныя сілы інерцыі.

Літ.: Левантовский В. И. Тяжесть, невесомость, перегрузка, М., 1964. *А. І. Болсун.* Мінск.

БЯЗЗЛІТКАВАЯ ПРАКАТКА, атрыманне ліста ці стужкі з вадкага металу. Працэс спалучае бесперапынную разліўку і *апрацоўку металаў ціскам.* Практыкуецца ў каляровай металургіі.




Б. п. атрымліваюць алюмініевую стужку таўшч. 5—10 і шыр. да 1000 *мм*. Расплаўлены алюміній падаюць па жолабе ў размеркавальную каробку, шчыльна падагнаную да валкоў-крышталізатараў, на паверхні якіх ён цвярдзее. Пры вярчэнні валкоў слаі металу зварваюцца і пракатваюцца. Скорасць пракаткі 0,6—1,0 *м/мін* (дыям. валкоў 470 *мм*). Алюмініевая стужка, атрыманая Б. п., вонкавым выглядам і мех. ўласцівасцямі не адрозніваецца ад пракатнай са злітка.

БЯЗЗУБКІ (Anodonta), група прэснаводных малюскаў сям. перлавіц. Цела ўкрыта ракавінай з дзвюх авальных створак, злучаных эластычнай звязкаю. Вядома каля 50 відаў. У БССР — 5. Водзяцца ў стаячых і з павольнай плыннаю вадаёмах, поўзаюць па дне ці зарываюцца ў іл. Кормяцца завіслымі водарасцямі, бактэрыямі і іх рэшткамі. Лічынкі Б. (глахідыі) — паскурныя паразіты рыб. Ракавіны — сыравіна для галантарэйнай прамысловасці, цела — корм с.-г. жывёле.

Літ.: Жизнь животных, т. 2, М., 1968.

БЯЗЗУБЫЯ КІТЫ, вусатыя кіты (Mystacoceti), падатрад млекакормячых атр. кітападобных. Самыя вялікія з млекакормячых (даўж. блакітнага кіта каля 33 *м*, маса каля 160 *т*). Формаю цела нагадваюць рыбу. Зубы закладваюцца, але рассысаюцца ў зародку; замест іх у верхняй сківіцы развіваюцца рагавыя пласціны, вядомыя пад назваю *кітовы вус* (адсюль — вусатыя кіты). Праз яго кіт адцэджвае з вады дробных жывёлін (малюскаў, ракападобных і інш.), якімі корміцца. Вядома 3 сям. Б. к. (шэрыя кіты, паласацікі, гладкія кіты), 10 відаў. У фаўне СССР — 8 відаў: грэнландскі, паўднёвы, шэры, сіні (блакітны), фінвал (селядцовы), сейвал, малы (вастраморды паласацік), гарбач (даўгарукі кіт). Б. к. жывуць ва ўсіх акіянах. Фінвал, сіні кіт — прамысл. (тлушч, мяса выкарыстоўваюцца ў харч. прамысловасці, кітовы вус — у тэхнічнай). Найважн. раёны сусв. лову Б. к. — воды Антарктыкі і паўн. ч. Ціхага акіяна.



Цэйлонскі рыбазмей.

Літ.: Томилин А. Г. Китообразные фауны морей СССР, М., 1962. *І. М. Сяржанін.* Мінск.

БЯЗМЕН, 1) даўняя ручная рычажная вага. Металічны або драўляны стрыжань з рухомым пунктам апоры (пятлёй). На адным канцы мае чашачку або кручок, на які падвешваецца груз; другі, патоўшчаны канец, служыць гірай. На стрыжань нанесена шкала вызначэння вагі. З-за недакладнасці вагі ў афіц. гандлі Расіі Б. забаронены. Карысталіся ім звычайна ў пар. практыцы куплі-продажу. Часам Б. называюць спружынную ручную вагу. 2) У 16—17 ст. Б. называлі на Русі адзінку масы, роўную 240 *залатнікам*, або 1,022 *кг*.

БЯЗНОГІЯ ЗЕМНАВОДНЫЯ (Apoda, Gymnophiona), атрад земнаводных. Цела чэрвепадобнае з частымі кальцавымі перахватамі, даўж. да 1 *м*. Хваста і канечнасцей няма. Спосаб жыцця пераважна падземны. Прадаўгаватая форма, адсутнасць органаў зроку і слыху, ніжні рот, добра развітыя органы нюху і ўнутранае асемяненне — вынік прыстасавання да падземнага спосабу жыцця. Вядома каля 60 відаў. Пашыраны ў трапічным поясе Азіі, Афрыкі, Амерыкі. Кормяцца насякомымі, чарвякамі і інш. глебавымі беспазваночнымі. Большасць адкладвае ў земляныя норы багатыя на жаўток яйцы. У адных відаў з яец выводзяцца лічынкі, якія заканчваюць метамарфозу ў вадзе, у другіх развіццё канчаецца ў яйцы. Некат. віды водных Б. з. жывародныя. Гл. таксама *Земнаводныя*.


БЯЗ'ЯДЗЕРНАЯ ЗОНА (бязатамная), прастора, на якой не вырабляецца і не размяшчаецца ядзерная (атамная) зброя. Ідэя пра стварэнне ў Цэнтр. Еўропе Б. з. была выказана ў прапановах Сав. ўрада па пытаннях раззбраення (у Падкамітэце Камісіі ААН па раззбраенні 27.3.1956 і 18.3.1957). На XII сесіі Ген. Асамблеі ААН урад Польскай Народнай Рэспублікі 2.10.1957 прапанаваў стварыць Б. з. ў Цэнтр. Еўропе. Змест прапановы: дзяржавы, якія ўваходзяць у Б. з., павінны ўзяць на сябе абавязацельства не вырабляць, не запасіць, не ўвозіць і не дазваляць размяшчаць на сваёй тэрыторыі ядзернай зброі ўсіх тыпаў, а таксама не ўстанаўліваць і не дапускаць устаноўкі на сваёй тэрыторыі абсталявання і прылад, што абслугоўваюць ядзерную зброю, у т. л. ракетных батарэй. Прапанова ПНР прадугледжвала першапачаткова ўключыць у Б. з. тры дзяржавы — ПНР, ГДР і ФРГ. У дзень абнародавання плана Б. з. да яго далучылася ЧССР. Сав. Саюз і інш. сацыяліст. краіны адобрылі гэты план у спец. урадавых заявах. Большасць бурж. дзяржаў па розных прычынах адхіліла прапанову пра стварэнне Б. з. ў Цэнтр. Еўропе. *М. М. Авакаў.* Мінск.

БЯКЕТАЎ Андрэй Мікалаевіч [26.11(8.12). 1825—1(14).7.1902], рускі батанік. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1891, ганаровы чл. з 1895). Праф. Пецярбургскага ун-та (1863—97). Распрацоўваў пытанні пра заканамернасці ў будове вегетатыўных наземных органаў раслін. Актыўна ўдзельнічаў у заснаванні першага рус. навуковага бат. часопіса «Ботанические записки» (1886). Адзін з першых рус. дарвіністаў, настаўнік многіх вядомых батанікаў, у т. л. К. А. Ціміразева і У. Л. Камарова.

Тв.: География растений, СПб., 1896; Учебник ботаники, 2 изд., СПб., 1897.

Літ.: Очерки по истории русской ботаники, М., 1947.

БЯКЕТАЎ Мікалай Мікалаевіч [1(13).1.1827, с. Алфер'еўка Пензенскага пав.— 30.11(13.12). 1911], рускі фізіка-хімік. Акад. Пецярбургскай АН (1886). Навук. працы належаць да фіз. і неарган. хіміі. Адкрыў рад актыўнасці металаў і даў фармулёўку (блізкую да сучаснай) закону дзейных мас. Выявіў магчымасць аднаўлення металаў з іх вокіслаў алюмініем і гэтым даў пачатак алюмінатэрміі. Праводзіў тэрмахім. даследаванні, у прыватнасці па вызначэнні цеплыні ўтварэння вокісаў шчолачных металаў. Ім упершыню пададзена фіз. хімія як самастойная навук. дысцыпліна.



Тв.: Избранные произведения по физической химии, Харьков, 1955.

Літ.: Беляев А. И. Николай Николаевич Бекетов — выдающийся русский физико-химик и металлург. 1827—1911, М., 1953.

БЯЛАВІЦКАЯ ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА, помнік драўлянага дойлідства 1-й пал. 17 ст. Пабудавана каля 1630 у Бялавічах (Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл.). У плане — выцягнуты прамавугольнік [(*м*) 23,3×9,0], мае двухпакатны дах, ва ўсх. частцы — трохвугольная апсіда, у зах.— над франтонам двух'ярусная квадратная вежа з васьмігранным барабанам і купалам. Сцены з тоўстага



бярвення вертыкальна ашаляваны дошкамі. Вызначаецца кампактнасцю аб'ёмнай пабудовы, прапарцыянальнасцю асобных частак. Каля царквы трох'ярусная мураваная вежа-званіца.

БЯЛАРУЧЫ, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 20 *км* на ПдЗ ад Лагойска, 26 *км* ад Мінска. 164 ж., двароў 54 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі. У Б. у 1898 скончыў нар. вучылішча Я. Купала. Вёску спалілі нямец.-фаш. захопнікі.

БЯЛГРАД (Београд), сталіца Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі і Сацыялістычнай Рэспублікі Сербіі, якая ўваходзіць у яе склад. Размешчаны пры ўпадзенні Савы ў Дунай. Вял. рачны порт, вузел чыгунак і аўтамаб. дарог. Міжнар. аэрапорт. 742 тыс. ж. (1968).

У старажытнасці на месцы Б. знаходзілася паселішча кельтаў Сінгідунум. У 1 ст. да н. э. ім авалодалі рымляне. З 6 ст. належаў Візантыі. Пад сербскай назвай Б. упершыню ўпамінаецца ў 9 ст. У 9—15 ст. ім пачаргова валодалі балгары, візантыя, зноў балгары, венгры, сербы. У 1521 захоплены туркамі. У выніку паўстанняў сербаў (1806 і 1815) вызвалены і стаў сталіцаю Сербскага княства (з 1882 — каралеўства). У 1-ю сусв. вайну двойчы акупаваны аўстр. войскамі. З 1.12.1918 сталіца Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 — Югаславія). 13.4.1941 фаш. Германія захапіла Б.

Бялград. Вуліца У. І. Леніна.



Вызвалены 20.10.1944 Сав. Арміяй і Нар.-вызв. арміяй Югаславіі.

Б.— вялікі індустр. цэнтр, па колькасці занятых у прамысловасці займае 2-е месца ў краіне пасля Заграба. Гал. галіны прамысловасці: машынабудаўнічая, металаапрацоўчая, тэкстыльная, хімічная. Найб. буйныя прадпр.: з-ды цяжкага машынабудавання і эл.-тэхн., 2 маторабудаўнічыя, суднаверф; тэкст. і фармацэўтычныя ф-кі.

Пераважаюць арх. помнікі 19—20 ст. У цытадэлі Калемегдан (1717—38, пабудавана на месцы рымскага лагера, пазней — сярэдневяковай крапасці) знаходзяцца: цэрквы св. Петкі (18 ст.), св. Ружыцы (в 1830); помнік удзячнасці Францыі (1929). У горадзе: мячэць Байраклі (17, 19 ст.), палац княгіні Любіцы (1831), арх. помнікі эклектызму — Народны т-р (1868), царква св. Савы (1895), парламент (1907), Стары ун-т. Пасля 1945 на левым беразе Савы будуецца масіў «Новага Бялграда». Шмат паркаў. У Б. Сербская АН, 43 ВНУ, у т. л. ун-т (в 1863). Нар. б-ка. Нацыянальны, Драматычны і інш. т-ры. Музеі: Народны, горада Бялграда, этнаграфіі, Галерэя фрэсак і інш.

БЯЛГРАДСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944, наступальная аперацыя войск 3-га Украінскага фронту (Маршал Сав. Саюза Ф. І. Талбухін), левага крыла 2-га Укр. фронту (Маршал Сав. Саюза Р. Я. Маліноўскі), Дунайскай ваеннай флатыліі (адм. С. Г. Гаршкоў), войск урада Айчыннага фронту Балгарыі і Народна-вызв. арміі Югаславіі (Маршал І. Броз-Ціта) па вызваленні Усх. і Паўн. Югаславіі і Бялграда ад ням.-фаш. захопнікаў. Праведзена 28 вер.— 20 кастр.

На фронце ад лукавіны Дуная да балгара-грэчаскай граніцы гэтым войскам процідзейнічалі асн. сілы ням.-фаш. групы армій «Ф». 28 вер. сав. войскі пачалі наступленне на Бялградскім напрамку. Да 10 кастр. прарвалі абарону немцаў ва Усх.-Сербскіх гарах і выйшлі ў даліну р. Маравы; 19 кастр. з часцямі югасл. Народна-вызв. арміі акружылі і разбілі 20-тысячную групоўку немцаў на ПдУ ад Бялграда, а 20 кастр. вызвалілі Бялград. На Пд балг. войскі занялі шэраг нас. пунктаў. У ходзе Б. а. разбіты аператыўная група немцаў «Сербія» і гал. сілы армейскай групы «Ф» (13 дывізій і брыгад), 6 дывізій групы армій «Е», перакінутых у Югаславію з Албаніі і Грэцыі, вызвалена тэр. Сербіі і створаны перадумовы вызвалення ўсёй Югаславіі і Албаніі ад ням.-фаш. захопнікаў.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945, т. 4, М., 1962; Советские Вооруженные Силы в борьбе за освобождение народов Югославии, под общ. ред. С. С. Бирюзова, М., 1960.

М. Я. Стральцоў. Мінск.

БЯЛЕВІЧ Антон Пятровіч [н. 14(27).5.1914, в. Дуброўка Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі паэт. З сялян. Вучыўся ў Магілёўскім палітасвет. ін-це (1933—35). Працаваў журналістам. У Айч. вайну ўдзельнічаў у партыз. руху. Друкуецца з 1937. Першы зб. «Чалавек з Дубровы» (1945) выйшаў у пер. на рус. мову. Апяванне жыцця калгаснай вёскі — асн. матыў лірыкі Б. Лепшыя паэмы прысвечаны Айч. вайне («Мой майстра», 1943, апубл. 1946; «Сям'я», 1946), гістар. мінуламу бел. сялянства («Каранні дуба», 1959). Песенна-нар. інтанацыі, традыцыйна-фальклорная вобразнасць — характэрныя рысы паэзіі Б. Выдаў зб.: «На бацькоўскіх сцежках» (1946), «Дарогай шчасця» (1952), «Жывая рака» (1955), «Вясёлка над полем» (1961) і інш. Аўтар кн. нарысаў «З добрай доляй заручоныя» (1960) і інш. Пераклаў на бел. мову «За даллю — даль» А. Твардоўскага, вершы А. Пракоф'ева, М. Бажана, А. Малышкі, І. Няходы, А. Ютчанкі і інш. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.



Тв.: Выбраныя творы, т. 1—2, Мн., 1969; Залатыя ключы, Мн., 1963; Высокі поўдзень, Мн., 1964; Рэха навальніц, Мн., 1965; Партрэт бацькаўшчыны, Мн., 1967; Я — з Дуброўкі, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Бярозкін Р. Спадарожніца часу, Мн., 1961, с. 170—198; Арочка М. Поўдзень паэта, «Полымя», 1965, № 1; Звонак А. Творчы набытак паэта, там жа, 1969, № 8.

А. А. Лойка. Мінск.

БЯЛЕНЕВА, вёска ў Какоўчынскім с/с Сеннеенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Карла Маркса. За 54 *км* на ПдУ ад Сянна, 86 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Багушэўская, на шашы Орша — Багушэўск. 306 ж., гасп. 87 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі закатавалі 20 жыхароў вёскі.

БЯЛЕННЕ, выдаленне дамешак і прыроднай афарбоўкі з матэрыялаў, каб надаць ім белы колер ці падрыхтаваць да фарбавання. Пашырана ў тэкст. прамысловасці, асабліва пры апрацоўцы вырабаў з бавоўны і лёну.

Б. тканіны бывае хімічнае і аптычнае. Хімічна тканіну адбельваюць растворамі гіпахларыту кальцыю, гіпахларыту натрыю, хларыту натрыю, перакісам вадароду і інш. Агрэгаты адбельвання складаюцца з апарату для запарвання тканіны і мыйна-матэрыяльных машын. У апошніх тканіну насычаюць бялільным растворам і вытрымліваюць 2—3 *гадз* у скрынях ці кампенсатарах. Дамешкі, якія за гэты час набылі здольнасць растварацца ў вадзе, выдаляюцца з тканіны прамыўкай, а рэшткі бялільнага рэчыва — слабым растворам сернай кіслаты і паўторнай прамыўкай водою. Пры аптычным Б. на тканіны напосяць белы фарбавальнік, бланкафор. Белы фарбавальнік паглынае нябачныя ультрафіялетавыя прамяні дзённага (сонечнага) святла і выпраменьвае іх у прастору, надаўшы сіне-фіялетавы колер. Злучаючыся з жоўтымі прамянямі, адбітымі тканінай, яны ўтвараюць белы колер. Пры эл. святле, не багатым на ультрафіялетавыя прамяні, эфект аптычнага Б. тканіцца.

Літ.: Степанов А. С. Развитие технологии отделки хлопчатобумажных, льняных и вискозных тканей. М., 1965.

І. В. Чанцоў. Мінск.

БЯЛЕЎ, вёска ў Марохараўскім с/с Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «III Інтэрнацыянал». За 16 *км* на ПдУ ад Жыткавіч, 220 *км* ад Гомеля, 5 *км* ад чыг. ст. Брынёва. 1095 ж., дварoў 328 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны.

БЯЛІЛЫ, пігменты белага колеру, якія з пакостам, алеямі і інш. рэчывамі ўтвараюць белыя фарбы. Займаюць гал. месца сярод *піментаў*.

Асаблівасць Б. — высокая покрыўная здольнасць (утвараюць тонкія неправарыстыя плёнкі). Найб. пашыраны цынкавыя Б. і літапон (сярыстыя Б.). Свінцовыя Б. вельмі ўстойлівыя, але ядавітыя і таму выкарыстоўваюцца толькі там, дзе патрэбны асабліва трывалыя пакрыцці (напр., для афарбоўкі караблёў). Тытанавыя Б. характарызуюцца белізной. Ужываюцца В. ў вытв. ўсіх відаў фарбаў і эмаляў, у папяровай, гумавай, скуранай, тэкст. і металург. прамысловасці, у вытв. пластмас і штучных валокнаў.

БЯЛІНСКАЯ Марыя Сяргееўна [н. 9(22).7.1906, Магілёў], беларуская савецкая актрыса. Нар. арт. БССР (1953). Чл. КПСС з 1947. Пасля сканчэння бел. тэатр. студыі ў Маскве (1926) працавала ў БДТ-2 (т-р імя Я. Коласа). У 1944 была ў складзе франтавой брыгады т-ра імя Я. Коласа. З 1965 у т-ры імя Я. Купалы. Выканаўца роляў гераінь, поўных характарных. Мастацтва Б. вызначаецца лірызмам, мяккасцю і ўзнёсласцю ў спалучэнні з драматызмам. Сярод роляў: Марына («Вайна вайне» Я. Коласа), Таццяна Марыч («Над Бярозай-ракой» П. Глебкі), Поля, Шурка («Мяшчане», «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага), Марыя Антонаўна («Рэвізор» М. Гогаля), Афелія («Гамлет» У. Шэкспіра), Марыя Аляксандраўна («Сям'я» І. Папова), Зіначка («У мяцеліцу» Л. Ляонава), Глушачыха («Людзі на балоце» паводле І. Мележа). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.





М. С. Бялінская ў ролі Шуркі (сцэна са спектакля).

Літ.: Гутковіч А. Шчасце — ствараць вобразы савецкіх жанчын, у зб.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960.

А. А. Лабовіч. Мінск.

БЯЛІНСКІ Вісарыён Рыгоравіч [30.5(11.6).1811, Свеабарг — 26.5(7.6).1848], рускі рэвалюцыянер-дэмакрат, літаратурны крытык і публіцыст, філосаф-матэрыяліст. З сям'і флоцкага лекара. Вучыўся ў Чамбарскім (г. Бялінскі) павятовым вучылішчы і ў Пензенскай гімназіі. У 1829 паступіў на славеснае адда. Маскоўскага ун-та, з якога выключаны ў 1832 за напісанне антыпрыгонніцкай драмы «Дзмітрый Калінін». У 1833 спрабаваў атрымаць месца павятовага настаўніка рус. мовы на Беларусі. Да прашэння папячыцелю Бел. навуч. акругі прыклаў рэферат «Мае думкі пра тое, якім чынам належыць дзейнічаць настаўніку пры навучанні рускай мове вучняў, што не могуць гаварыць на ёй, і які з свайго боку не ведае іх айчыннай мовы», у ім упершыню выклаў свае пед. погляды. У пасадзе настаўніка Б. адмовілі з-за паліт. ненадзейнасці. З 1833 супрацоўнік час. «Телескоп». У дадатку да яго — «Молве» апублікаваў сваю першую буйную працу «Літаратурныя мары» (1834), у якой выступіў за рэаліст. кірунак у рускай л-ры, за яе збліжэнне з народам, супраць рэакц. тэорыі афіц. народнасці. Рэдагаваў час. «Московский наблюдатель» (1838—39). У канцы 1839 пераехаў у Пецярбург, вёў літ.-крытыч. аддзел час. «Отечественные записки». З 1846 пераходзіць у «Современник», які выдаваў М. Някрасаў, і становіцца ідэйным кіраўніком часопіса. Памёр у Пецярбурзе ад туберкулёзу.



Ідэйнае развіццё Б. было складанае і супярэчлівае — ад асветніцтва да рэвалюц. дэмакратызму, ад ідэалізму да матэрыялізму. У 1837—39, знаходзячыся на пазіцыях філас. ідэалізму, Б. тлумачыў тэзіс Гегеля «ўсё сапраўднае разумнае, усё разумнае сапраўднае» з пазіцый апраўдання існуючай рэчаіснасці. Пад уплывам нарастання класавай барацьбы ў Расіі, рэвалюц. падзей у краінах Зах. Еўропы Б. ў канцы 1839 — пач. 1840 парывае з «прымірэнчымі настроямі» і цвёрда становіцца на пазіцыі матэрыялізму і рэвалюц. дэмакратызму. Найвыш. выражэннем рэвалюц. дэмакратызму Б. з'явілася «Пісьмо да Гогаля» (1847). У ім Б. адлюстраваў настроі і спадзяванні прыгонных сялян, іх абурэнне і пратэст супраць самадзяржаўна-прыгонніцкага прыгнёту. У. І. Ленін назваў «Пісьмо да Гогаля» «адным з лепшых твораў бесцэнзурнага дэмакратычнага друку, захаваўшых велізарнае, жывое значэнне і да гэтага часу» (Тв., т. 20, с. 225—226). У 40-я г. Б. стаў цэнтр. фігурай перадавой грамадскай думкі Расіі, натхніцелем вызв. руху, выступіў за рэвалюц. пераўтварэнне Расіі на сацыяліст. асновах. Ён пайшоў уперад у параўнанні з прадстаўнікамі утапічнага сацыялізма Зах. Еўропы, бо імкнуўся звязаць сацыялізм з дэмакр. рэвалюцыяй. Барацьба з самадзяржаўна-прыгонніцкім ладам і яго рэліг. ідэалогіяй, з ліберaламі — прыхільнікамі філас. ідэалізму — накіроўвала Б. ў бок матэрыялізму і атэізму. Матэрыяліст. тэндэнцыі выявіліся ў яго яшчэ ў 30-я г. і ўзмацніліся з пераходам на пазіцыі рэвалюц. дэмакратызму. У апошнія гады дзейнасці (1844—48) Б. становіцца ваяўнічым матэрыялістам і атэістам, усутыч

падыходзіць да дыялект. матэрыялізму. Ён адчуў жыватворны ўплыў ранніх прац К. Маркса «Да крытыкі гегелеўскай філасофіі права» і «Да яўрэйскага пытання», і хоць яму не ўдалося пераадолець ідэаліст. разумення гісторыі, грамадска-паліт. погляды мысліцеля мелі каштоўныя зачаткі матэрыяліст. разумення з'яў грамадскага жыцця. Б. выказваў здагадкі пра важную ролю матэрыяльных патрэб у развіцці гр-ва, падкрэсліваў значэнне класавай барацьбы, лічыў народ творчай сілай гісторыі, прызнаваў адносную прагрэсіўнасць капіталізму, заканамернасць яго ўзнікнення і недаўгавечны характар, гнеўна бічаваў буржуазію, якая прыйшла да ўлады і прынесла працоўным галечу і пакуты.

Б. залажыў асновы рэвалюц.-дэмакр. эстэтыкі і літ. крытыкі. Ён змагаўся за рэалізм, ідэйнасць і народнасць л-ры і мастацтва, выступаў супраць «чыстага мастацтва», рэакц. рамантызму, дыдактычнай белетрыстыкі і псеўданароднасці. У артыкулах пра А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Гогаля, у аглядах рус. л-ры (1840—47) паказаў самабытнасць і веліч рускай л-ры, раскрыў яе рэалізм і народнасць. Яго навацтарская дзейнасць у галіне літ. крытыкі і эстэтыкі зрабіла велізарны ўплыў на развіццё перадавой л-ры і мастацтва. Шмат рацыянальных, глыбока гуманістычных ідэй выказаў Б. ў галіне этыкі. Ён быў рашучым праціўнікам шавінізму і касмапалітызму. Пафасам усёй дзейнасці Б., як зазначыў М. Чарнышэўскі, быў палымяны патрыятызм.

Тв.: Полн. собр. соч., т. 1—13, М., 1953—1959.

Літ.: Ленін У. І. Што рабіць?, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 6); Яго ж. Аб «вехах», Тв., т. 16 (Полн. собр. соч., т. 19); Поляков М. Виссарион Белинский. Личность — идеи — эпоха, М., 1960; Степанов В. И. Философские и социологические воззрения В. Г. Белинского, Мн., 1959.

В. І. Сцяпанаў. Мінск.

БЯЛКІ, пратэіны (ад грэч. protos першы, галоўны), высокамалекулярныя прыродныя арган. рэчывы, малекула якіх складаецца з амінакіслот. Адзін з самых важных кампанентаў, што ўваходзяць у састаў усіх жывых арганізмаў. Паводле Ф. Энгельса, жыццё — гэта спосаб існавання бялковых цел. Сінтэзуюцца Б. з неарган. рэчываў раслінамі і некат. бактэрыямі. Жывёльныя арганізмы атрымліваюць з ежы гатовыя Б. Стрававальнымі ферментамі яны расшчапляюцца ў арганізме на пептыды і *амінакіслоты*, а з апошніх, пераважна ў рыбасомах клетак (гл. *Біясінтэз*), з дапамогай нуклеінавых к-т і ферментаў сінтэзуюцца Б., спецыфічныя пэўнаму арганізму. Б. ажыццяўляюць абмен рэчываў у арганізме і ўплываюць на яго жыццёвыя функцыі (рост, размнажэнне, рэгуляцыю ўтварэння генетычнага апарату, удзельнічаюць у перадачы спадчынных прыкмет, стравanні, пераносе кісларoду і вуглякіслага газу, мускульных скарачэннях і інш.). Бялкі-ферменты (гл. *Ферменты*) маюць здольнасць выконваць спецыфічныя каталітычныя функцыі; ад іх залежыць скорасць і кірунак хім. ператварэнняў у жывой прыродзе. Выключна важнае значэнне ў рэгуляцыі фізіял. працэсаў маюць бялкі-гармоны (гл. *Гармоны*).

Паводле хім. саставу і растваральнасці Б. падзяляюцца на простыя (пратэіны) і складаныя (*пратэіды*). Простыя складаюцца з астаткаў амінакіслот; складаныя — з простага бялку, злучанага з небялковым кампанентам. Простыя Б. падзяляюць на *альбуміны*, *глабуліны*, глютэліны, праламіны, гістоны, пратэіноіды і пратаміны. Да складаных Б. належаць *нуклеапратэіды*, *фосфапратэіды*, *глікапратэіды*, металапратэіды (змяшчаюць металы), многія бялкі-ферменты, бялкі-гармоны, імунныя бялкі (гл. *Імунітэт*). Працэнтны састаў Б. (у пераліку на сухое рэчыва): С — 50—55, Н — 6—7,5, О — 21—24, N — 15—18,5, S — 0,3—2,5, Р — 1—2 і інш. Малекулярная маса ад 5—12 тыс. да 10 млн. Большасць Б. растворацца ў вадзе і ўтвараюць малекулярныя растворы, якім уласцівы нізкі асматычны ціск і высокая вязкасць. Малекулы Б. не праходзяць праз паўпранікальныя мембраны, што выкарыстоўваецца для ачысткі іх ад нізкамалекулярных злучэнняў. Б. змяшчаюць у сабе карбаксільныя і амінныя групы, таму ў растворах яны амфатэрныя (маюць уласцівасці асноў і кіслот). Пры гідролізе распадаюцца да амінакіслот; пад уплывам розных фактараў здольныя да дэнатурацыі, каагуляцыі; уступаюць у рэакцыі акіслення, узнаўлення, нітравання і інш. У састаў Б. уваходзяць 20—22 розныя амінакіслаты. Колькасць амінакіслотных астаткаў у малекуле Б. ад 50 да 6000 і больш. Яны звязаны паміж сабою пептыднай сувяззю (—NH—CO—) у доўгія ланцугі — *поліпептыды*. Апошнія адрозніваюцца амінакіслотным саставам, паслядоўнасцю, даўжынёй, структурай. Вядомы 4 структуры (парадкі або ўзроўні) арганізацыі бялковай малекулы. Першы парадак — паслядоўнае размяшчэнне амінакіслотных астаткаў у поліпептыдным ланцузе бялковай малекулы; другі — прасторавы, найчасцей спіралепадобны стан поліпептыднага ланцуга; трэці — канфігурацыя, якая ўзнікае ад закручвання другога парадку ў больш кампактную глабулярную форму; чацвёрты парадак — злучэнне некалькіх часцін з трэцічнай структурай у адну больш буйную, комплексную. Фарміраванне прасторавай канфігурацыі малекул Б. вызначаецца прысутнасцю ў поліпептыдных ланцугах вадародных і дысульфідных, эфірных і солевых сувязей, сіл Ван дэр Ваальса і інш. Уласцівасці Б. залежаць ад хім. будовы і прасторавай арганізацыі (канфармацыі). Пры якасным аналізе Б. карыстаюцца каляровымі рэакцыямі: біурэтавай (даказвае прысутнасць пептыднай сувязі), ксантапратэінавай, нінгідрынавай і інш.; пры колькасным — колераметрычным і спектрафотаметрычным метадамі. Амінакіслотны састаў і канцэнтрацыю асобных амінакіслот вызначаюць гідролізам Б., раздзяленнем амінакіслот рознымі метадамі храматаграфіі і далейшым вызначэннем той ці інш. амінакіслаты з дапамогай нінгідрынавай рэакцыі, аўтам. амінааналізатарам.

Б. неабходны для жыўлення арганізма. Чалавек і жывёла павінны атрымліваць патрэбную колькасць паўнацэнных (якія маюць усе незаменныя амінакіслоты) Б. Калі ў ежы колькасць іх меншае, арганізм расходуе ўласныя Б. У медыцыне як лекавыя прафілактычныя сродкі ад многіх хвароб выкарыстоўваюцца: інсулін — для лячэння цукровага дыябету; сывараткі альбумін — як замяняльнік крыві; гама-глабулін і імунныя сывараткі — для засцярогі і лячэння ад інфекцыйных хвароб; фібрынавая плёнка з крыві — каб спыніць крывацёк; бялкі-ферменты (гіялуранідаза, трыпсін, хіматрыпсін, дэзоксірыбануклеаза, трамбін, плазмін, альдалаза, амілаза) — у лячэнні парушэнняў абмену рэчываў; гідралізаты Б.— для штучнага жыўлення. Выкарыстоўваюцца Б. ў вытворчасці шоўку, шэрсці, пластмас.

На Беларусі Б. вывучаюцца ў лабараторыі бялку і азоцістага абмену, лабараторыі біяхіміі раслін Ін-та эксперым. батанікі АН БССР (даследуюцца прырода, уласцівасці, заканамернасці назапашвання і ператварэння розных Б. лубіну і бульбы ў працэсе іх росту, развіцця і хавання), у Аддзеле малекулярнай біяэнергетыкі лабараторыі біяфізікі і ізатопаў АН БССР (высвятляецца роля кааператыўных пераходаў бялкоў клеткі ў рэгулятарных працэсах), у Аддзеле фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін АН БССР (вызначаецца сувязь актыўнасці ферментаў глебы з яе ўрадлівасцю і інш.), на кафедрах біяхіміі мед. ін-таў і ун-таў.

Літ.: Поглазов Б. Ф. Структура и функции сократительных белков, М., 1965; Парина Е. В. Возраст и обмен белков, Харьков, 1967; Кретович В. Л. Введение в энзимологию, М., 1967; Конев С. В. Электронно-возбужденные состояния биополимеров, Мн., 1965; Купревич В. Ф. и Щербакова Т. А. Почвенная энзимология, Мн., 1966; Мироненко А. В. Физиология и биохимия люпина, Мн., 1965; Вторая биохимическая конференция Прибалтийских республик и Белорусской ССР, Рига, 1965; Третья биохимическая конференция Белорусской, Латвийской, Литовской и Эстонской Советских Социалистических Республик, т. 1—2, Мн., 1968; Белки, пер. с англ., т. 1—3 (ч. 1—2), М., 1956—1959. Гл. таксама літ. пры арт. *Біясінтэз*.

А. В. Міраненка. Мінск.

БЯЛКОЎШЧЫНА, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Перамога». За 6 *км* на ПдЗ ад Смаргоні, 257 *км* ад Гродна, 4 *км* ад чыг. ст. Смаргонь. 69 ж., гасп. 24 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БЯЛОВА (дзявочае Новікава) Алена Дзмітрыеўна (н. 28.7.1947, г. Савецкая Гавань Прыморскага краю), беларуская спартсменка, засл. майстар спорту СССР па фехтаванні. Пераможца юнацкага першынства СССР (1964, 1965) і маладзёжнага першынства СССР (1965, 1966, 1967). Чэмпіёнка СССР у камандных спаборніцтвах (1968) і ў асабістых спаборніцтвах (1969). Пераможца Кубка Марціні (1968) і Кубка Еўропы (1969, г. Турын, Італія), турніра на прыз «Сярэбраная рапіра» (1968 і 1969, г. Кома, Італія). Двухразовая чэмпіёнка XIX Алімп. гульняў у Мехіка (1968) у камандных і асабістых спаборніцтвах. Чэмпіёнка свету (1969) у асабістых спаборніцтвах (г. Гавана, Куба). Студэнтка Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага (1970). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».



БЯЛОЎ Аляксандр Кузьміч [н. 27.9(10.10).1911, в. Стара-Мосіна Краснаярскай акр. Енісейскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з ліп. 1941. Вызначыўся 23.6.1944 пры прарыве абароны ворага каля в. Казаногава Сіроцінскага р-на Віцебскай вобл. і 25.6.1944 пры фарсіраванні Зах. Дзвіны. Жыве ў г. п. Балахта Краснаярскага краю.

БЯЛОЎ Аляксей Іванавіч [н. 16(29).4.1912, в. Вярзебнева Жыздрынскага пав. Калужскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. Вызначыўся ў баях пры фарсіраванні Дняпра ў вер. 1943 каля Брагіна Палескай вобл. Пад агнём праціўніка пераправіўся на заходні бераг, знішчыў кулямёты разлік ворага, гэтым садзейнічаў пераправе роты і замацаванню яе на плацдарме. Прабраўшыся ў тыл гітлераўцаў, закідаў іх гранатамі, знішчыў 2 агнямёты і кулямёт. Жыве ў г. п. Клятня Бранскай вобл.

БЯЛОЎ Вячаслаў Аляксандравіч (н. 25.2.1938, г. Ленінград), майстар спорту СССР міжнар. класа па сучасным пяцібор'і. Скончыў Ерэванскі ін-т фіз. культуры (1966). Інструктар па спорце Беларускага савета СТ «Дынама». Чэмпіён свету (Будапешт, 1969) у камандным заліку.

БЯЛОЎ Іван Панфілавіч [15(27).6.1893, в. Калінічава Чарапавецкага пав. Пецярбургскай губ.— студз. 1938], савецкі ваенны дзеяч, камандарм 1-га рангу (1935). Чл. КПСС з 1919. З сялян. У кастр. 1917 на чале 1-га Сібірскага палка ў Ташкенце перайшоў на бок Сав. улады, быў нач. гарнізона і камендантам Ташкенцкай крэпасці. У грамадз. вайну галоўнакамандуючы войск Туркестанскай Сав. Рэспублікі, Бухарскай групы войск, камандуючы войск Харэзмскай Рэспублікі. Удзельнік ліквідацыі контррэвалюц. мяцяжу ў г. Верны (з 1921 Алма-Ата), разгрому бандаў на Кубані. Скончыў курсы вышэйшага каманднага саставу Акадэміі Ген. штаба, камандаваў войскамі Паўн.-Каўказскай, Ленінградскай, Маскоўскай, Беларускай (1937—38) ваен. акруг. Чл. ЦК КП(б)Б, дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі, ганаровай зброяй.

Літ.: Ворожейкин Г. и др. Революцией призванный, «Военно-исторический журнал», 1963, № 6.


М. І. Каміскі. Мінск.

БЯЛОЎ Павел Аляксеевіч [5(17).2.1897, г. Шуя Уладзімірскай губ.— 3.12.1962], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944), ген.-палкоўнік. Чл. КПСС з 1925. Удзельнік грамадз. вайны. На франтах Айч. вайны з чэрв. 1941. Кавалерыйскі корпус, якім камандаваў Б., абараняў Маскву. З 1942 камандуючы 61-й арміі, якая вызначылася пры фарсіраванні Дняпра, вызваленні Калінкавіч, Мазыра, Пінска, Кобрына, Брэста і ў баях за Берлін. Пасля вайны камандуючы ваен. акруг. З 1955 узначальваў ДТСААФ. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—3-га скл.

БЯЛОЎ Рыгор Андрэевіч [н. 1(14).10.1901, в. Сара Алатырскага пав. Сімбірскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1919. У Чырв. Арміі з 1920. 16-я гвардз. кав. дывізія, якою камандаваў Б., вызначылася ў баях пры фарсіраванні Дняпра на Гомельшчыне, пры ліквідацыі рэчыцкай групоўкі

праціўніка і вызваленні Мазыра. Ген.-л. Б. жыве ў Маскве.

БЯЛУГА (Huso huso), каштоўная прамысл. рыба сям. асятровых. Даўж. да 4 *м*, маса да 1 *т*. Вялікі рот у форме паўмесяца, упоперак міжжабернага прамежка — складка, якая ўтварылася ад зрастання жаберных перапонак. Водзіцца ў Каспійскім, Азоўскім, Чорным і Адрыятычным м. Палавай спеласці дасягае на 12—18-м годзе. Нераставаць




выходзіць у рэкі, адкладвае на цвёрды грунт да 1,5 млн. ікрынак. Маляўкі скочваюцца ў мора, кормяцца малюскамі, ракападобнымі, а дарослыя Б.— рыбай. Ікра Б. буйнейшая, чым у інш. асятровых, ідзе на прыгатаванне зярністай ікры.

БЯЛУХА, млекакормячая жывёла падатр. *зубатых кітоў*.

БЯЛЫНАВІЧЫ, вёска ў Бабініцкім с/с Віцебскага р-на. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 15 *км* на ПнУ ад Віцебска, 18 *км* ад чыг. ст. Віцебск, на шашы Віцебск — Сураж. 396 ж., двароў 96 (1970). Пач. школа, клуб, бібліятэка.

БЯЛЫНІЦКІ РАЁН, у складзе Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на ПнЗ вобл., у верхнім цячэнні р. Друць (прыток Дняпра). Пл. 1,4 тыс. *км*². Нас. 42,1 тыс.




Майстэрня па рамонце бульбакапалак у Бялыніцкім раённым аб'яднанні Сельгастэхнікі.

чал. (1969). Падзяляецца на 8 сельсаветаў. Цэнтр г. п. Бялынічы.


Большую частку раёна займае *Цэнтральнабярэзінская раўніна*, на Пн заходзяць адгор'і Аршанскага ўзв. Пераважная выш. паверхні 150—180 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу — 24,5 млн. *т* (у т. л. радовішчы Няропля — 10,7 млн. *т* і Эсьмонаўскі Мох — 10,2 млн. *т*), 2 радовішчы цагельных глін (190 тыс. *м*³). Сярэдняя т-ра студз. ад —7 да —7,5, ліп. 18—18,5 °С. Ападкаў 660 *мм* за год. Вегет. перыяд 190 дзён. Рэкі: Друць з прытокамі Няропля, Вабіч, Аслік; Клява (прыток Бярэзіны). Найб. азёры: Заазерскае, Чорнае і Няропля. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (58%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (25%), алювіяльныя тарфяна-балотныя і тарфяна-балотныя (9%), дзярнова забалачальныя (4%), алювіяльныя дзярнова-балотныя (4%). З мінер. глебаў 56,2% сугліністых, 32,1 супясчаных, 11,7% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 45 (цана бала 0,22 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 28, усіх с.-г. угоддзяў — 40. Пад лесам каля 40% тэр., пераважаюць хваёвыя. Насяляюць раён беларусы (96,8%), ёсць рускія, яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. нас. 30 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас.— 12,6%.


Прамысловасць для перапрацоўкі мясцовай сыравіны. У Бялынічах: крухмальны з-д і масласырзавод, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Друцкае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. Камбінат буд. м. у в. Свяцілавічы. У раёне 12 калгасаў і 5 саўгасаў (1970).

Калгасы і іх цэнтры: «Запаветы Леніна» *(Камяніца)*, імя Заслонава *(Студзёнка)*, імя Ільіча *(Іскра)*, «Камінтэрн» *(Малы Кудзін)*, імя Кірава *(Новасёлкі)*, імя Леніна *(Алешкавічы)*, «Ленінскі заклік» *(Масцішча)*, «Наша











Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача. Сцэны са спектакляў: 1. «Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага. 1956. 2. «Папараць-кветка» І. Козела. 1957. 3. «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела. 1961. 4. «Клоп» У. Маякоўскага. 1962. 5. «За лясамі дрымучымі» А. Вольскага і П. Макаля. 1958. 6. «Цудоўная дудка» В. Вольскага. 1968. 7. «Прыгоды Бураціна» паводле А. Талстога. 1966.










В. К. Бялыніцкі-Біруля. Лотаць зацвіла. 1947. Алей. Дзяржаўны мастацкі музей БССР.



Дамы рабочых саўгаса «Бялынічы».


перамога» *(Галоўчын)*, «Радзіма» *(Вішоў)*, імя Фрунзе *(Ермалавічы)*, імя Чкалава *(Лебядзянка)*, імя Энгельса *(Рагач)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Бялынічы» *(Бялынічы)*, «Друць» *(Цяхцін)*, «Каліноўскі» *(Вялікая Машчаніца)*, «Подзевічы» *(Заполле)*, «Эсьмоны» *(Эсьмоны)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і бульбаводстве. Пад с.-г. ўгоддзямі калля 47% тэрыторыі. На 1.1. 1970 асушана 5,2 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969), 46,2, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 21,7, тэхн. 1,7, бульбай 7,1, пад кармавымі 15,4. На пач. 1970 буйн. раг. жывёлы (тыс. галоў) 31 (у т. л. кароў 15,6), свіней 19,5, авечак і коз 2,8. Па тэр. раёна праходзіць шаша Мінск — Магілёў, Аслік — ст. Друць.

На пач. 1970 у раёне 9 сярэдніх, 17 васьмігадовых, 54 пачатковыя, 2 школы рабочай і сельскай моладзі, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. механізацыі с. гасп.; 40 масавых б-к, 31 клубная ўстанова, 39 кінаўстановак, у т. л. 30 стацыянарных, 6 бальніц, паліклініка, 18 фельч.-ак. пунктаў. У 1970 у р-не працавала 330 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 35 інжынераў, 21 аграном, 214 настаўнікаў, 32 урачы, 28 заатэхнікаў і вет. урачоў; 709 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Зара камунізма».

А. С. Акінчыц. Мінск.

БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ Вітольд Каятанавіч [17(29).2.1872, вёска Крынкі каля Бялынічаў Аршанскага павета Магілёўскай губ.— 18.6.1957], беларускі і рускі савецкі жывапісец-пейзажыст. Нар. мастак БССР (1944) і РСФСР (1947). Акад. жывапісу (1908). Правадз. чл. АМ СССР (1947), ганаровы акад. АН БССР (1947). Дзяцінства прайшло на Віцебшчыне. З 1884 наведваў рысавальную школу М. Мурашкі ў Кіеве. У 1889—97 вучыўся ў Маскоўскім вуч. жывапісу, ваяння і дойлідства ў С. Каровіна, М. Неўрава і І. Пранішнікава. Чл. Т-ва перасоўных выставак (з 1904), Т-ва імя Куінджы, Саюза рус. мастакоў. Адзін з арганізатараў Асацыяцыі маста-



коў рэвалюц. Расіі. У маст. выстаўках удзельнічаў з 1892. Развіваў традыцыі рус. лірычнага пейзажа. Эмацыянальныя, змястоўныя творы Б.-Б. вызначаюцца мяккім серабрыста-бэзавым і зеленаватым каларытам. Сярод работ ранняга перыяду найб. вядомыя: «З аколіц Пяцігорска» (1897, набыў П. Трацякоў), «Вясна ідзе» (выстаўка Маскоўскага т-ва аматараў маст., 1-я прэмія, 1899), «Вечныя снягі» (Каўказская юбілейная выстаўка, залаты медаль, 1901). Аўтар серыі пейзажаў, зробленых у Горках Ленінскіх пад Масквой (1924, 1945), лірычных твораў, прасякнутых аптымізмам («Лёд прайшоў», 1930; «Вечар юнага мая», 1940). У час Вял. Айч. вайны стварыў шэраг палотнаў («Па слядах фашысцкіх варвараў», 1942; «Вясной павеяла», 1943), удзельнічаў у арганізацыі маст. выстаўкі, прысвечанай 25-годдзю БССР (Масква, 1944). У 1947 падарожнічаў па Беларусі, напісаў пазт. пейзажы з ярка выражаным нац. характарам: «Зялёны май», «Пачатак лета», «Вёсачка», «Беларусь. Зноў расцвіла вясна», «Яблыні ў квецені». Лепшыя карціны апошніх гадоў: «Дні юнага мая», «Вераснёўскі вечар», «Дні майскіх навальніц». У Дзярж. маст. музеі БССР 444 работы мастака, у т. л. «Лотаць зацвіла». Імем Б.-Б. названы Бялыніцкі маст. музей. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Туроўпікаў М. Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі-Біруля, Мн., 1959; Тарасов Л. Витольд Каэтанович Бялыницкий-Бируля. Народный художник РСФСР и БССР, М.— Л., 1949; Пысін А. Музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Бялынічах, «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», 1970, № 1. *Л. Н. Дробаў.* Мінск.

БЯЛЫНІЧЫ, гар. пас. (з 1938), цэнтр Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл. На левым беразе р. Друць (прыток Дняпра), за 44 *км* ад Магілёва, на шашы Мінск — Магілёў. 5,3 тыс. ж. (1969).



Бялынічы. Вуліца Савецкая.

Вядомы з 16 ст. У 17 ст. працавала друкарня, у якой выдаваліся малітоўнікі і пропаведзі. Абеліск на ўшанаванне памяці вайск. часцей, злучэнняў, якія вызвалялі Б. ў чэрв. 1944.

Масласырзавод, крухмальны з-д, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. 2 сярэднія школы, школа рабочай моладзі, музычная і дзіцячая спартыўная школы, 3 дашкольныя ўстановы, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. механізацыі с. гасп.; Дом культуры, Дом піянераў, кінатэатр, 2 б-кі. Маст. музей, які носіць імя В. К. *Бялыніцкага-Бірулі* (з 1970).


БЯЛЫНКАВІЧЫ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл. на р. Беседзь. Цэнтр

сельсавета і саўгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 14 *км* на Пд ад Касцюковіч, 174 *км* ад Магілёва, 2 *км* ад чыг. ст. Бялынкавічы. 725 ж., двароў 197 (1970). Хімлесаўчастак (выраб шкіпінару, драўнянага вугалю, воцатна-кальцыевага парашку, жывіцы). Пякарня, спіртзавод, лясніцтва, майстэрня быт. абслугоўвання, майстэрня для рамонту с.-г. тэхнікі. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У парку мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці жыхароў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

БЯЛЬДЗЮГА (Zoarces viviparus), рыба сям. бяльдзюгавых. Даўж. да 45 *см*. Цела прадаўгаватае, плямістае. Спінны і анальны плаўнікі доўгія, зліваюцца з хваставым і ўтвараюць складку, якая аблямоўвае заднюю частку цела. Водзіцца каля берагоў Белага, Баранцава, Нарвежскага, Балтыйскага і Паўночнага м. Летам трымаецца каля берагоў, зімой адыходзіць у глыбокія месцы. Корміцца малюскамі, ракападобнымі, ікрой і малаўкамі рыб. Б.— жывародная рыба. Нараджае да 400 малявак даўж. каля 4 *см*. Аб'ект промыслу.

БЯЛЬКЕВІЧ Іван Кандратавіч [22.2(6.3). 1883, в. Варонічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ.— 18.10.1960], беларускі мовазнавец. З сялян. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1909), БДУ (1925). Настаўнік, інспектар Наркамата асветы БССР, дырэктар Мсціслаўскага пед. тэхнікума, навук. супрацоўнік Інбелкульта, потым Ін-та мовы АН БССР (1927—30). Аўтар артыкулаў па бел. мовазнаўстве, «Краёвага слоўніка ўсходняй Магілёўшчыны» (1970) — самага поўнага абл. слоўніка бел. мовы.

БЯЛЬКЕВІЧ Пётр Іларыёнавіч [н. 14(27).1. 1907, Мінск), беларускі савецкі фізіка-хімік. Чл.-кар. АН БССР (1953), д-р хім. н. (1952). Чл. КПСС з 1946. У 1947—52 нам. дырэктара Ін-та хіміі АН БССР, у 1952—60 дырэктар Ін-та торфу АН БССР, з 1960 заг. лабараторыі фізікахіміі торфу ў гэтым ін-це. Выкладае ў БДУ (1947—60, з 1952 прафесар) і Бел. тэхнал. ін-це імя Кірава (1965—67). Асн. працы па вывучэнні кінетыкі тэрмічнага раскладання цвёрдых рэчываў і прыродных рэсурсаў БССР (пераважна хім. перапрацоўкі торфу). Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны новыя шляхі выкарыстання торфу ў нар. гасп. (вытв. воску, пластычных мас, тарфашчолач. рэагентаў).



Тв.: (Разам з К. А. Гайдук і М. І. Мінкевічам) Исследование кинетики низкотемпературного термолиза тростникового торфа, «Доклады АН БССР», 1968, т. 12, № 8; (у сааўт.) Спектральное исследование понообменных групп торфов и гуминовых кислот, «Весці АН БССР. Сер. хім. навук», 1968, № 5; (у сааўт.) Торф как активный наполнитель пресспорошковых пластмасс. Получение термообработанного торфа, там жа, 1967, № 2.

Літ.: Маркевич С. В. Петр Илларионович Белькевич (К 60-летию со дня рождения), «Весці АН БССР. Сер. хім. навук», 1967, № 1.

БЯЛЬКОЎШЧЫНА, вёска ў Жоўнінскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Усход». За 4 *км* на У ад Верхнядзвінска, 170 *км* ад Віцебска, 6 *км* ад чыг. ст. Верхнядзвінск. 202 ж., гасп. 62 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

БЯЛЬМО, памутненне рагавой абалонкі вока ад яе рубцовага перараджэння. Бывае прыроджанае (запаленне рагавіцы ў перыяд унутрывантробнага развіцця) і набытае (вынік хвароб, траўмаў вачэй). Да Кастр. рэв. на Беларусі Б. ад трахомы, воспы, паўзучай язвы нярэдка было прычынай слепаты.

Памутненні адрозніваюцца паводле інтэнсіўнасці: негустое — «воблачка», больш шчыльнае — «пляма», шчыльнае, белага колеру — уласна Б. Уплыў яго на зрок залежыць ад інтэнсіўнасці і месца на рагавіцы вока. Найб. зніжае зрок Б., якое знаходзіцца супраць зрэнкі. На периферыі рагавой абалонкі Б. мала ўплывае на зрок. Прафілактыка: своечасовае лячэнне запаленчых працэсаў рагавіцы, засцярога ад траўмаў вачэй. Лячэнне: білгенныя стымулятары, вітамінатэрапія, крыятэрапія. Вядомы рускі афтальмолаг У. П. Філатаў распрацаваў хірург. лячэнне (выдаленне Б. і замена яго трупнай тканкай рагавіцы).

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969. *Р. Я. Воднева.* Мінск.

БЯЛЬМОНТ, стараж. парк, помнік прыроды ў Віцебскай вобл. За 8 *км* на ПдУ ад г. Браслава, на паўд.-ўсх. беразе воз. Дрывяты. Пл. 65 *га* (акрамя палосы лесу ў 300 *м* вакол парку). Заложаны ў 19 ст. ў час пераходнага перыяду ад рэгулярнага да пейзажнага стылю. (Рысамі рэгулярнага стылю вызначаецца пабудова вадаёмаў, размяшчэнне штучных узгоркаў, тэрас з лесвіцамі, некат. алей.) Растуць елка, хвоя веймутава, дуб чарэшчаты, арэх чорны, лістоўніца сібірская, таполя канадская, акацыя жоўтая, ліпа, бяроза, ясень, туя заходняя, глог калючы, піхта сібірская і інш. Узрост дрэваў 70—100 гадоў. Месца адпачынку працоўных.

Я. М. Навумчык. Мінск.

БЯЛЬМОНТЫ, вёска ў Ахрэмаўскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на паўдўсх. беразе воз. Дрывяты. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 10 *км* на ПдУ ад Браслава, 230 *км* ад Віцебска, 40 *км* ад чыг. ст. Друя. 730 ж., двароў 150 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, за 3 *км* ад Б. торфабрыкеты з-д. Васьмігадовая школа, 2 клубы, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Побач з вёскаю парк *Бяльмонт*.

БЯЛЮК (Anthericum), род шматгадовых травяністых раслін сям. лілейных. Сцябло выш. да 80 *см*. Лісце прыкаранёвае, вузкалінейнае, жалабчатае. Кветкі белыя, у мяцёлках або гронках. Плод — каробачка. Вядомы адзін від — Б. галінасты (A. ramosum), пашыраны ў Сярэдняй і Паўднёвай Еўропе, на Беларусі — усюды. Бел. нар. назвы: вяночнік, білюк. Расце ў сухіх хваёвых лясах і хмызняках. Дэкар. расліна. Вырошчваецца ў культуры з канца 16 ст.

Літ.: Флора БССР, т. 1, М., 1949.



БЯЛЯВІН Евель Самуілавіч (н. 3.5.1920, г. Барысаў), Герой Сав. Саюза (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1941. Працаваў слесарам на з-дах Барысава. Скончыў Мінскі аэраклуб (1937). На фронце з ліст. 1941, камандзір звяна, эскадрыллі. Удзельнік баёў на Паўд., Закаўказскім, Варонежскім, Сцяпным, 2-м і 1-м Укр. франтах. Зрабіў каля 300 баявых вылетаў. Жыве ў Мінску.

БЯЛЯЕЎ Валянцін Емяльянавіч [н. 6(19). 10.1914, в. Вядца Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1933. На фронце з чэрв. 1941. З 10.5.1942 камандзір узвода ў партыз. атрадзе Заслонава; з 15.9.1942 камандзір партыз. атрада імя Лазо; з 25.9.1943 камісар *партызанскай брыгады 2-й імя К. С. Заслонава*. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Лідзе.

БЯЛЯЕЎ Віктар Міхайлавіч [25.1(6.2).1888, Ніжнеўральск — 16.2.1968], рускі савецкі музыказнавец і фальклярыст, стваральнік першай манаграфіі па муз. фальклоры беларусаў. Д-р мастацтвазнаўства (1944), праф. (1919). Аўтар прац па сав. і зарубежнай музыцы, старарус. муз. пісьменнасці. Распрацоўваў тэарэт. праблемы муз. фальклору народаў СССР і зарубежных краін. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Пауль Хиндемит, Л., 1927; Белорусская народная музыка, Л., 1941; Афганская народная музыка, М., 1960; Древнерусская музыкальная письменность, М., 1962; Очерки по истории музыки народов СССР, в. 1—2, М., 1962—63.

БЯЛЯЕЎ Іван Дамітрыевіч [1810 — 19.11 (1.12).1873], рускі гісторык-славянафіл. У 1852—73 праф. Маскоўскага ун-та, сакратар Маскоўскага т-ва гісторыі і старажытнасцей расійскіх. Аўтар першай сістэматызаванай працы па гісторыі сялян. Даследаваў некат. пытанні гісторыі Беларусі да 16 ст. У «Гісторыі Полацка, ці Паўночна-Заходняй Русі...» прааналізаваў сац. і нац. склад насельніцтва, гісторыю царквы і адміністрацыі Кіеўскай Русі і Вял. кн. Літоўскага. Паводле яго меркаванняў, славяне пачалі каланізацыю тэр. Беларусі з Ноўгарада. Разглядаючы вечавы лад у Полацку, выказваў ідэю бесканфліктнай садружнасці ўлады і народа. Першы з рус. гісторыкаў даў этнагр. апісанне беларусаў, якіх называў крывічамі.

Тв.: Очерк истории Северо-Западного края России, Вильна, 1867; Рассказы из русской истории, кн. 4, ч. 1 — История Полотска, или Северо-Западной Руси, от древнейших времен до Люблинской унии, М., 1872; Крестьяне на Руси, 4 изд., М., 1903.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

БЯЛЯЕЎ Павел Іванавіч (26.6.1925, с. Чэлішчава Расляцінскага пав. Валагодскай губ.— 10.1.1970), лётчык-касманаўт СССР. Герой Сав. Саюза (1965), палкоўнік. Чл. КПСС з 1949. З 1943 у Сав. Арміі. У 1945 скончыў авіяцыйнае вучылішча, у 1959 Ваенна-паветр. акадэмію. Удзельнік вайны з Японіяй. Б.— камандзір касм. карабля «Узыход-2», на якім 18—19.3.1965 з А. А. *Лявонавым* ажыццявіў палёт у космас. У час палёту кіраваў першым у свеце эксперыментам па выхадзе чалавека ў космас, вёў назіранне за А. А. Лявонавым, меў з ім бесперапынную сувязь. Пілатаваны ім карабель зрабіў 17 абаротаў вакол Зямлі і праляцеў адлегласць больш як 720 тыс. *км*. Пры пасадцы (каля Пермі) Б. выкарыстаў ручную сістэму кіравання. Узнаг. ордэнам Леніна і інш. савецкімі і замежнымі ордэнамі і медалямі.



БЯЛЯЕЎ Спартак Цімафеевіч (н. 27.10.1923, Масква), савецкі фізік. Акад. АН СССР (1968, чл.-кар. 1964). Чл. КПСС з 1943. У 1952—62 працаваў у Ін-це атамнай энергіі імя Курчатава, з 1962 у Ін-це ядзернай фізікі Сібірскага аддз. АН СССР, з 1965 рэктар Новасібірскага ун-та. Асн. навук. працы па фізіцы рэлятывісцкай плазмы, квантавай тэорыі многіх часцінак, тэорыі атамнага ядра. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Применение методов квантовой теории поля к системе Бозе-частиц, «Журнал экспериментальной и теоретической физики», 1958, т. 34, в. 2.

БЯЛЯЕЎ Якаў Дзмітрыевіч (15.3.1918, в. Пічалёва Кінешамскага пав. Іванава-Вазнясенскай губ.— 6.7.1941), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1941). Канд. у чл. КПСС. У Чырв. Арміі з 1938. Вызначыўся 25.6.1941 у баях каля Астрашыцкага Гарадка і 6.7.1941 каля в. Гібайлавічы, Сомры Крупскага р-на Мінскай вобл. Камандзір бронемашыны сяржант Б. са сваім экіпажам знішчыў нямецкі танк, 4 аўтамашыны, 3 матацыклы. Загінуў у баі.

БЯЛЯЕЎКА, вёска ў Чачэрскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 9 *км* на ПнУ ад Чачэрска, 75 *км* ад Гомеля, 44 *км* ад чыг. ст. Буда-Кашалёўская. 801 ж., двароў 205 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

БЯЛЯК Юзаф (1741, Навагрудчына — чэрв. 1794), ген.-м. літоўскага войска, удзельнік паўстання на Беларусі 1794. Падтрымліваў *Барскую канфедэрацыю*, у 1792 на чале пярэдняга корпуса літоўскага войска ваяваў пад Свержанем, Міром, Зэльвай і Брэстам. З 8.6. 1794 камандзір гродзенскага паўстанцкага корпуса.

БЯЛЯНКА (Lactarius pubescens), шапкавы ядомы грыб сям. сыраежкавых. Шапка 4—6 *см* у дыяметры, белая, у цэнтры светла-крэмавая, валакністая, з падагнутым пушысташаўковым краем. Пласцінкі бела-ружаватыя. Малочны сок густы, едкі, на смак гаркаваты. Ножка кароткая, голая. Мякаць белая. Расце ў маладых бярозавых і мяшаных лясах, на палянах. На Беларусі часта трапляецца ў забалочаным бярэзніку. Ужываецца соленая (спачатку вымочваюць, каб

не было гаркаты). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Грыбы*.

БЯЛЯШКА Васіль Пятровіч [13(26).2.1900, Магілёў — 18.3.1951], удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, сав. ваен. дзеяч, ген.-м. (1943). З рабочых. Чл. КПСС з 1940. У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік ліквідацыі стракапытаўскага мяцяжу ў Гомелі (1919), ваяваў на Зах. фронце пад Барысавам, Бабруйскам, Мінскам, супраць Юдзеніча пад Араніенбаўмам, Псковам, Нарвай. Скончыў Магілёўскае камерцыйнае вуч. (1918), Акадэмію Ген. штаба (1941). З 1936 нач. штаба дывізіі. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну старшы пам. і нам. нач. аператыўнага аддзела штаба Зах. фронту. З чэрв. 1942 камандзір стралк. брыгады. У 1943—48 выкладчык Ваен. акадэміі Ген. штаба, нач. вучылішча, нач. курса Ваен. акадэміі імя Фрунзе. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам Югаславіі. *У. А. Пурын.* Масква.

БЯЛЯНКІ (Pieridae), сям. вялікіх дзённых матылёў атр. лускакрылых. Крылы белыя або аранжавыя ці жоўтыя са слабаразвітым малюнкам, размах да 8 *см*. Унутраны край задняга крыла прылягае да брушка. Вочы вялікія, добра развітыя, займаюць большую частку галавы. Вядома больш за 500 відаў, пашыраных ва ўсіх краінах свету. У СССР каля 80 відаў. Сярод Б. шкоднікі с.-г. культур і дрэў: капусны бялян, або капуснік (P. brassicae), бручніца (P. napi), рэпніца (P. rapae), баярышніца (Aporia crataegi), лімонніца (Gonepteryx rhamni). Вусені іх кормяцца лісцем, кветкамі раслін. Знішчаюць Б. механічнымі, біялаг. і хім. метадамі.

БЯЛЯНЫ, вёска ў Асвейскім пасялковым Савеце Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Авангард». За 35 *км* на Пн ад Верхнядзвінска, 205 *км* ад Віцебска, 37 *км* ад чыг. ст. Верхнядзвінск. 134 ж., двароў 41 (1970). Пач. школа, клуб, магазін.

БЯЛЯЦКІ Дзмітрый Паўлавіч [н. 20.10 (2.11).1906, в. Пуглякі Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі вучоны ў галіне сацыяльнай гігіены і арганізацыі аховы здароўя. Д-р мед. н. (1967), праф. (1968). Засл. ўрач БССР (1967). Чл. КПСС з 1944. У 1933 скончыў Мінскі мед. ін-т. Да 1941 старшы дзярж. сан. інспектар БССР. Удзельнік Айч. вайны (1941—43), нам. міністра аховы здароўя БССР (1943—59). З 1946 заг. кафедры сац. гігіены і арг-цыі аховы здароўя Мінскага мед. ін-та. Асн. працы па арганізацыі аховы здароўя, сан. справы і эпідэміялогіі інфекцыйных хвароб у БССР. Узнаг. 5 ордэнамі, медалямі.

Тв.: (Разам з Р. Кручком). Ахова здароўя ў Беларускай ССР, Мн., 1958; Профилактика — основа развития советского здравоохранения, Мн., 1961; Развитие санитарного дела в Белорусской ССР, Мн., 1966.

Літ.: Дмитрий Павлович Беляцкий, «Здравоохранение Белоруссии», 1966, № 10; Д. П. Беляцкий, «Советское здравоохранение», 1966, № 11.

БЯНЕЎСКІ Казімір Іванавіч [11(23).8.1899, Літын Падольскай губ.— 3.7.1968], беларускі савецкі альтыст. Засл. арт. БССР (1955). Вучыўся ў Варшаўскай кансерваторыі (1918—21). Працаваў у аркестрах муз. т-раў Віцебска, Кіева, Баку. З 1937 канцэртмайстар групы альтоў у аркестры Бел. т-ра оперы і балета. Удзельнік Дзярж. квартэта БССР.

БЯРВЕНАЎКА, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 32 *км* на Пд ад Буда-Кашалёва, 58 *км* ад Гомеля, 25 *км* ад чыг. ст. Уза. 106 ж., двароў 41 (1970). Магазін.

БЯРДЫШ, старадаўняя зброя з лязом у форме паўмесяца, з завостраным доўгім драўляным цаўём. Пашыраны ў Рус. дзяржаве ў 16—17 ст., ужываўся пешымі воінамі, пераважна стральцамі, якія насілі Б. на рамянях за плячыма. У некат. дзяржавах Зах. Еўропы Б. адпавядала *алебарда*.



БЯРНОВА, возера ў бас. р. Обаль, правага прытока Зах. Дзвіны, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,79 *км²*. Даўж. 3,4 *км*, найб. шыр. 1,5 *км*, сярэдняя 0,8 *км*, найб. глыб. 10,9 *м*, сярэдняя 6,3 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы ўкрыты мяшаным лесам. Берагі часткова забалочаныя. Пл. вадазбору 57,6 *км²*. У Б. ўпадае р. Віраўлянка, выцякае з яго р. Бярноўка. Воз. эўтрофнага тыпу. Водзяцца лешч, судак, шчупак, акунь, плотка.

БЯРОЗА (Betula), род лістападных дрэваў і кустоў сям. бярозавых. Кара на ствалах белая, у некат. відаў цёмна-шэрая. Лісце цэласпае, зубчастае, з перыстым жылкаваннем. Кветкі сабраны ў каташкі. Большасць відаў святлалюбныя, марозаўстойлівыя, непатрабавальныя да глебавых умоў, хутка растуць. Вядома 120 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і ад субтропікаў да тундры. У СССР каля 40 відаў, у БССР 4: Б. бародаўчатая, гузаватая, або звіслая (B. verrucosa), Б. пушыстая (B. pubescens) — лясныя дрэвы, з якіх першая расце пераважна на суходоле, другая — на балоце; Б. нізкая (B. humilis), Б. карлікавая (B. nana) — кусты, якія растуць на балоце. Апошні від у БССР расце вельмі рэдка ў паўн. раёнах. Апрача мясцовых, у сады і паркі завезена яшчэ 16 відаў. Б. выкарыстоўваецца на азеляненне нас. пунктаў, абсадку дарог, у полеахоўных палосах. Бярозавых лясоў у БССР каля 800 тыс. *га*, ці больш за 15% усёй плошчы лясоў. Найб. прадукцыйныя тыпы бярэзніку (кіслічны, сніткавы, чарнічны) даюць у 40—50-гадовым узросце да 350—400 *м³* драўніны на 1 *га*. Драўніна ідзе на выраб фанеры, лыжаў, мэблі, вугалю, воцту, ацэтону, метылавага спірту. Асабліва цэніцца драўніна *карэльскай бярозы* за прыгожы ўзорысты малюнак. Бярозавы сок мае да 20% цукру, шырока выкарыстоўваецца мясц. насельніцтвам. У медыцыне ўжываюцца пупышкі, лісце і грыбныя ўтварэнні — *суба*.




Бяроза бародаўчатая.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэндралогія*.

В. С. Гельтман. Мінск.

БЯРОЗА (да 1940 Бяроза-Картузская, Картуз-Бяроза), горад, цэнтр Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. На р. Ясельда, за 102 *км* на ПнУ ад Брэста, на шашы Мінск — Брэст, 6 *км* ад чыг. ст. Бяроза-Картузская (на лініі Мінск — Брэст). 7,5 тыс. ж. (1969).



Бяроза. Плошча Леніна.

Першае ўпамінанне Б. ў гістар. дакументах адносіцца да 1477. У 17 ст. канцлер Вял. кн. Літ. Леў Сапега заснаваў тут каталіцкі манастыр ордэна картузаў (адсюль і назва Бяроза-Картузская, Картуз-Бяроза). Гэта быў адзін з самых вялікіх і багатых манастыроў Рэчы Паспалітай. Пасля паўстання 1863, у якім актыўна ўдзельнічалі манахі-картэзіянцы, манастыр і касцёл разбураны. У бурж. Польшчы (1921—39) павятовы цэнтр. Тут дзейнічала падпольная арг-цыя КПЗБ, якая ўзначальвала барацьбу працоўных павета супраць бурж.-памешчыцкіх улад. У чэрв. 1934 польскі ўрад арганізаваў *Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер*. У Вял. Айч. вайну гітлераўцы разбурылі і спалілі амаль увесь горад.

Помнік У. І. Леніну. На тэр. былога канцлагера абеліск на ўшанаванне памяці рэвалюцыянераў. Помнік на брацкай магіле 366 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. Каля сцяны колішняга манастыра, дзе ням. акупанты расстралялі больш за 4,5 тыс. чал., абеліск ахвярам фашызму. Мемарыяльныя дошкі вызваліцелям Б. ад фаш. акупацыі і на доме А. А. *Альшэўскага*. У Б. нарадзіўся П. В. *Горын* — прэзідэнт АН БССР у 1931—36.

З-ды: Нова-Бярозаўскі вапняковы, матораремонтны, металаканструкцый, з-д жалезабетонных вырабаў, камбінаты буд. м. і быт. абслугоўвання, масласыразавод, пякарня, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. 2 сярэднія школы, школа рабочай моладзі, муз. школа, 4 дашкольныя ўстановы; Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца, *Бярозаўскі гісторыка-рэвалюцыйны музей*. Часткова збярогся арх. помнік 17 ст.— *Бярозаўскі картэзіянскі манастыр*.

БЯРОЗА, вёска ў Яроміцкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «За мір». За 14 *км* на Пн ад Кобрына, 64 *км* ад Брэста. 452 ж., двароў 162 (1970). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Б. ўпершыню ўпамінаецца над 1563. Першапач. назва — Беразое.

БЯРОЗАВАЕ, возера ў бас. р. Тураўлянкі (Дзівы), ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 4,9 *км²*. Даўж. 4,1 *км*. Найб. шыр. 1,5 *км*, сярэдняя 1,2 *км*, найб. глыб. 3,9 *м*, сярэдняя 2,5 *м*. Катлавіна авальная, выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Берагі нізкія, забалочаныя, занятыя балотнай расліннасцю і алешнікам. Сплавіны ў паўд. частцы. Плоскае ложа ўслана крамянязёмістымі сапрапелямі. Вадазбор (453 *км²*) дробнаўзгорысты і паката-хвалісты. Складаецца з марэнных суглінкаў. Воз. эўтрофнага тыпу, значна зарастае. Праточнасць вялікая. Дзіва ўпадае на ПдЗ і выцякае на Пн. Водзяцца плотка, шчупак, карась, лешч, мянтуз.

БЯРОЗАВІК, традыцыйны напітак беларусаў з бярозавага соку (з кляновага соку — кляновік). Вясною ў ніжняй частцы ствала бярозы ці клёна робяць неглыбокую падсечку, убіваюць вузкі драўляны жалабок, па якім сок сцякае ў карытца. У бочку з сокам дадаюць прарошчаны і падсмажаны ячмень або сухары і ставяць у цёмнае халаднаватае месца, часам закопваюць у зямлю на 4—6 тыдняў. Вытрыманы ў такіх умовах квас робіцца смачны і добра праганяе смагу ў летнюю спёку. Самавольная падсочка дрэў забаронена. Нарыхтоўваюць бярозавы сок лясгасы рэспублікі.

БЯРОЗАВІЧЫ, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Кутузава. За 20 *км* на З ад Пінска, 170 *км* ад Брэста, 9 *км* ад чыг. ст. Малоткавічы. 1042 ж., двароў 275 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, урачэбны ўчастак, адд. сувязі, 2 магазіны.

БЯРОЗАВЫ ГРЫБ, грыб сямейства губавых. Гл. *Губа*.

БЯРОЗА-КАРТУЗСКІ КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫ ЛАГЕР, месца зняволення паліт. вязняў у бурж. Польшчы. Створаны паводле распараджэння прэзідэнта Польскай рэспублікі ад 17.6.1934 для ізаляцыі камуністаў, камсамольцаў і левых элементаў.

Людзей зняволвалі без следства і суда, на падставе хадайніцтва мясцовай адміністрацыі, часта на неабмежаваны тэрмін. Канцлагер размяшчаўся ў колішніх ваен. казармах мяст. Бяроза-Картузская Палескага ваяводства. Вызначаўся жорсткім рэжымам. Вязням забаранялася размаўляць памiж сабой, павольна хадзіць. За любое парушэнне рэжыму адміністрацыя лагера кідала зняволеных у карцар, біла. Сістэмай здзекаў, пяспынняў і бяссэнсавай муштры яна імкнулася зламаць волю вязняў, давесці да фіз. і маральнага знемажэння, прымусіць іх падпісаць дэкларацыю пра спыненне камуніст. дзейнасці і прапаганды. Але паліт. вязні былі стойкія і мужныя. У канцлагеры існавала вакансіпіраваная камуніст. арг-цыя, якая дзейнічала праз парт. тройкі камер. У склад парт. к-та ў розны час уваходзілі чл. КПЗБ і КПП: І. А. Саланевіч, І. І. Райскі, С. С. Самайловіч. У Б.-К. к. л. былі зняволены актыўныя дзеячы КПЗБ, КПЗУ і КПП, сярод іх А. І. Кароль, Ф. І. Маркаў, украінскі паэт А. Я. *Гайрылюк*. Тут закатаваны камуністы А. А. Мазырка, А. В. Германскі, Ю. Нядзельскі і інш. Камуніст. арг-цыя ў лагеры існавала і пасля роспуску КПП і ля аўтаномных частак КПЗБ і КПЗУ летам 1938. Працоўныя Польшчы, Зах. Беларусі, Зах. Украіны, а таксама СССР, прагрэс. сілы ўсяго свету рашуча пратэставалі супраць існавання Б.-К. к. л., вялі барацьбу ў абарону яго вязняў, памагалі сем'ям зняволеных. Канцлагер ліквідаваны ў вер. 1939

пасля вызвалення Зах. Беларусі Чырв. Арміяй. У 1961 адкрыты *Бярозаўскі гісторыка-рэвалюцыйны музей.*

Літ.: Они не стали на колени, Мн., 1966; Гаврилюк А. Песни из Березы, М., 1954; Berezіacy, Warszawa, 1965. *У. С. Пасэ.* Мінск.

БЯРОЗАЎКА, рака, правы прыток Дзісны (бас. Зах. Дзвіны), у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Даўж. 42 *км.* Пачынаецца з воз. Вялікае і цячэ па слабаперасечанай раўніне, укрытай мяшаным лесам і хмызняком. Пл. вадазбору 747 *км²*. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 4,8 *м³/сек.* Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік пры асушэнні балот.

БЯРОЗАЎКА, рака, правы прыток Дняпра. Даўж. 26 *км.* Цячэ у Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. Вадазбор (230 *км²*) — плато з ярамі і суфазійнымі западзінамі. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,5 *м³/сек.*

БЯРОЗАЎКА, рабочы пас. (з 1959) у Лідскім р-не Гродзенскай вобл. На левым беразе Нёмана (1,5 *км*), за 27 *км* на ПдУ ад Ліды, 138 *км* ад Гродна, 7 *км* ад чыг. ст. Нёман. Аўтобусная станцыя. 5,1 тыс. ж. (1969). Вядомы за межамі рэспублікі і краіны *шклозавод «Нёман».* Камбінат быт. абслугоўвання, лясніцтва. Сярэдняя школа і школа рабочай моладзі, 2 дзіцячыя сады, дзіцячыя яслі, 2 б-кі, Палац культуры, заводскі прафілакторый, бальніца, музей.

БЯРОЗАЎКА, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр сельсавета. За 15 *км* на ПдУ ад Глуска, 177 *км* ад Магілёва, 17 *км* ад чыг. ст. Ратміравічы. 297 ж., двароў 95 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік 14 партызанам, якія загінулі ў час замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадз. вайны. Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

БЯРОЗАЎКА, вёска ў Крыпульскім с/с Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Жданава. За 17 *км* на ПдЗ ад Докшыц, 212 *км* ад Віцебска, каля шашы Докшыцы — Вілейка (1 *км*). 326 ж., двароў 84 (1970). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, мед. і вет. пункты, дзіцячыя яслі.

БЯРОЗАЎКА, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 39 *км* на ПдУ ад Калінкавіч, 162 *км* ад Гомеля, каля шашы Калінкавічы — Хойнікі (2 *км*). 960 ж., двароў 268 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. На У за 0,5 *км* ад вёскі на р. Жалонь сляды неалітычнага паселення.

БЯРОЗАЎКА, вёска ў Гіжэнкаўскім с/с Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Проня (1 *км*). Цэнтр калгаса «Радзіма». За 27 *км* на Пн ад Слаўгарада, 60 *км* ад Магілёва, 22 *км* ад чыг. ст. Чавусы. 331 ж., двароў 120 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

БЯРОЗАЎСКАЕ, возера ў бас. р. Бярозкі, правага прытока р. Крывінкі, у Сенненскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,99 *км²*. Найб. глыб. 16 *м* (Пн). Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ, складаецца з двух плёсаў. Карэнны бераг на Пд выш. 10—12 *м*, у астатніх частках спадзісты. Дно складанай будовы. Пл. вадазбору 25 *км²*. Воз. эўтрофнага тыпу, зарастае. Выток р. Бярозкі. Водзяцца верхаводка, плотка, акунь, лешч, шчупак.

БЯРОЗАЎСКАЕ, возера ў бас. р. Паловіцы, правага прытока Дзісны, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,5 *км²*. Даўж. 1,15 *км*. Сярэдняя шыр. 0,4 *км*, найб. глыб. 2 *м*. Дно роўнае, плоскае. Рэльеф вадазбору (7,75 *км²*) пераважна ўзгорыста-марэнны. Б. эўтрофна-дыстрофнага тыпу. Злучаецца ручаём з воз. Карпінскае. Водзяцца шчупак, акунь, плотка, карась, лінь.


БЯРОЗАЎСКАЯ ДРЭС, Дзяржаўная раённая электрастанцыя імя 50-годдзя Беларускай ССР, адна з



Машынная зала.

першых блочных электрастанцый у рэспубліцы. Пабудавана каля пас. *Белаазерск* Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. Уваходзіць у Бел. энергасістэму, а таксама забяспечвае эл. энергіяй некат. раёны ПНР і ГДР. Буд-ва пачалося ў 1958. Першы прамысл. ток дала ў 1961. Апошні, шосты, блок пушчаны ў 1967. Магутнасць ДРЭС 920 тыс. *квт.* Асн. паліва вугаль, дашаўскі газ. На пач. 1970 выпрацавала 22,96 млрд. *квт · гадз.*

БЯРОЗАЎСКІ ГІСТОРЫКА-РЭВАЛЮЦЫЙНЫ МУЗЕЙ, заснаваны ў 1961 у г. *Бярозa* Брэсцкай вобл. У фондах і 6 экспазіцыйных залах (пл. 207,7 *м²*) каля 8 тыс. экспанатаў. Экспазіцыя адлюстроўвае гал. этапы рэвалюц. руху на Беларусі (пераважна ў Зах. Беларусі) і сацыяліст. буд-ва ў БССР. Тэматычныя раздзелы: дарэвалюц. мінулае Бярозаўшчыны (канец 19 — пач. 20 ст.); 1-я сусв. вайна, Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. і грамадз. вайна (1914—20); барацьба працоўных за сац. і нац. вызваленне ў перыяд акупацыі Зах. Беларусі бурж. Польшчай (1921—39); *Бярозa-Картузскі канцэнтрацыйны лагер* (1934—39); вызваленне краю і ўз'яднанне ў адзінай Бел. дзяржаве (1939—41); барацьба працоўных Бярозаўшчыны ў Вял. Айч. вайну 1941—45. Сярод экспанатаў — дакумент. матэрыял пра *паўстанне 1863—64* у Польшчы, на Беларусі і ў Літве, дзейнасць *Паўночна-Заходняга абласнога*



Будынак Бярозаўскага гісторыка-рэвалюцыйнага музея.


камітэта РСДРП(б) і *Палескага камітэта РСДРП(б),* пра рэвалюцыйную дзейнасць М. В. Фрунзе і А. Ф. Мяснікова на Зах. фронце. Шырока адлюстраваны падзеі Вял. Айч. вайны на Бярозаўшчыне, дзейнасць *Брэсцкага партызанскага злучэння, Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б*; фотаздымкі і дакументы пра зверствы ням.-фаш. акупантаў на *Броннай Гары*, ва ўрочышчы Смалярка і інш. Спец. дыярама прысвечана Здзітаўскай абароне 1944. У 1969 музей наведала больш за 65 тыс. чал.

М. Дз. Сікорын. Бяроза.

БЯРОЗАЎСКІ КАРТЭЗІЯНСКІ МАНАСТЫР, архітэктурны ансамбль барока. Збудаваны ў 1648—89 у г. *Бяроза* італьян. дойлідамі. Комплекс манастыра (касцёл, які злучаўся з асн. памяшканнямі калідорамі-галерэямі, трапезная, бібліятэка, шпіталь, аптэка, келлі, гасп. пабудовы) быў абнесены мураванай сцяной з невялікімі вежамі і каплічкай. У цэнтры манастыра — званіца тыпу данжон, якая знаходзілася ў замкнутым гал. двары і межавала з алтарнай часткай касцёла. У званіцы — вітая лесвіца (у тоўшчы сцяны), ярусы, прыстасаваныя для размяшчэння гармат. Да Б. к. м. падступаў сад з вадаёмамі. Манастыр няраз разбураўся і збярогся часткова.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 492—493.

Бярозаўскі картэзіянскі манастыр. Архіўны чарцёж 1-й пал. 19 ст.






Возера Чорнае.

БЯРОЗАЎСКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Пл. 1,5 тыс. *км²*. Нас. 65,9 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 14 сельсаветаў; рабочы пас. Белаазерск. Цэнтр г. Бяроза.

Паверхня раёна — плоска-хвалістая раўніна, якая паніжаецца з ПнЗ на ПдУ (выш. 150—180 *м* над узр. м.). Пераважаюць водна-ледавіковыя пясчаныя і пясчана-жвіровыя, у нізінай паўд.-ўсх. частцы — рачныя, азёрныя і балотныя пясчана-гліністыя і тарфяністыя адклады. Карысныя выкапні: 6 радовішчаў торфу — 66,8 млн. *т* (у т. л. радовішча Аброўскае — 29,8 млн. *т* і Стубла — 14,2 млн. *т*), 5 радовішчаў цагельных глін — 2,0 млн. *м³* (у т. л. радовішчы Бяроза-Картузская — 1,3 млн. *м³* і Навасёлкі — 0,3 млн. *м³*), 4 радовішчы мелу — 4,2 млн. *т* (у т. л. радовішча Картуз-Бяроза — 2,1 млн. *т* і Кабакі — 1,5 млн. *т*), 2 радовішчы буд. пяскоў — 1,9 млн. *м³* (у т. л. радовішча Малеч — 1,0 млн. *м³*). Сярэдняя т-ра студз. ад —5 да —5,5, ліп. 18—18,5 °С. Ападкаў 580 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Рэкі: Ясельда (прыток Прыпяці), яе прытокі: канал Вінец (правы) і Жыгулянка (левы); азёры: Чорнае, Белае і Спораўскае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (54%), у т. л. дзярнова-падзолістыя часова залішне ўвільготненыя (23%); тарфяна-балотныя (20%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (13,6%), дзярнова-глеяватыя (12,4%). З мінер. глебаў 91,5% супясчаных, 8,5% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 37 (цана бала 0,34 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 29, усіх с.-г. угоддзяў — 34. Пад лесам 22% тэр., пера-


БЯРОЗАЎСКІ РАЁН
Б Р Э С Ц К А Я
В О Б Л.
Б Е Л А Р У С К І
П О Л І С К І
Р А Ё Н
Бяроза
Стрыгінь
Старыя Пяскі
Белаазерск
Малеч
Кабакі
Ўзлавы
Першамайская
Ястрабель
Высокае
Малое Міжлессе
Вял. Міжлессе
Горск
Баркі
Судзілавічы
Мачульшчына
Дзятлавічы
Дубраўка
Намежжа
Хойна
Вулька
Ўласавічы
Вулька-Арлоўская
Хітлін
Старыя Пяскі
Здзітава
Опаль
Ясенавец
Ляхавічы
Гарошкавічы
Свяцкі
Салец
Нарутовічы
Асавец
Дуксмер
Ручнікі
Агароднікі
Ніўкі
Чорнае
Ніва
Ельня
Ельнік
Ракітна
Ліпнікі
Ліпнікі
Ліпнікі


1953, в. 3; Сычевская А. И. Памва Берында и его Вирши на рождество Христово и др. дни, «Чтения в историч. обществе Нестора летописца», Киев, 1912, кн. 23, в. 1. *М. Р. Суднік.* Мінск.

БЯРЭЖА, возера ў бас. р. Друйкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,25 *км²*. Даўж. 2,4 *км*, найб. шыр. 1,4 *км*, сярэдняя 0,9 *км*, найб. глыб. 8,4 *м*, сярэдняя 3,2 *м*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Схілы спадзістыя, на Пд укрыты сасной і хмызняком, паўн.-ўсходнія нізкія, забалочаныя, месцамі ворныя землі. Дно плоскае. Зараснікі трысняг на Пн і ПдУ возера. Паўн.-ўсх. заліў зарос эладэяй. Вадазбор (10 *км²*) буйнаўзгорысты на Пд., марэнпаградавы (озы, камы) на ПдУ; пераважаюць марэнныя суглінкі і супескі. У паўн. частцы Б. злучаецца ручаём з воз. Ельна. Водзяцца лешч, шчупак, плотка, лінь, акунь і інш.

БЯРЭЖА, возера ў бас. р. Бярэжы, левага прытока Дзісны, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,76 *км²*. Даўж. 1,2 *км*, найб. шыр. 1 *км*, сярэдняя 0,6 *км*. Катлавіна круглявая, схілы нізкія. Вадазбор (10,5 *км²*) нізінны, забалочаны. Воз. эўтрофна-дыстрофнага тыту. Выток р. Бярэжы. Злучана канавай з воз. Доўгім. Водзяцца плотка, шчупак, лешч, лінь, карась.

БЯРЭЗІН Іван Мікалаевіч (чэрв. 1923, с. Лябяжае Барнаульскай акругі Томскай губ.— 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1943. Вызначыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны каля Віцебска. Ноччу 25.6.1944 пад шквальным агнём ворага падпоўз да перасоўнага кулямёта, які перагарадзіў шлях наступленню сав. войск, і ручнымі гранатамі знішчыў яго разлік. Гэтым садзейнічаў пераправе сав. часцей. Загінуў у баі.

БЯРЭЗІНА, рака, правы прыток Дняпра. Даўж. 613 *км*, пл. вадазбору 24 500 *км²*. Пачынаецца з забалочанай упадзіны, за 1 *км* на ПдЗ ад Докшыц Віцебскай вобл., на выш. каля 180 *м* над узр. м., упадае ў Дняпро за 25 *км* вышэй Рэчыцы. Цячэ па Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, Гомельскай абл. Верхняя частка басейна ў межах Мінскага ўзв. і Верхнебярэзінскай азёрна-ледавіковай нізіны, сярэдняя — на Цэнтральнабярэзінскай раўніне, а ніжняя ў межах Гомельскага Палесся. Б. працякае праз азёры Медзазол (у вярхоўі) і Палік (ніжэй в. Крайцы). Шыр. ракі на ўчастках ад вытоку да воз. Палік 15—20 *м*, ад воз. Палік да вусця р. Свіслачы 50—80 *м*, ад упадзення р. Свіслачы ў Б. да вусця 100—150 *м*. Берагі ў нізоўі і вярхоўі нізкія, у сярэднім цячэнні — стромкія, зарослыя хмызняком. Гал. прытокі: Сергуч, Сха, Бобр, Клява, Ольса, Ала (злева); Проня, Гайна, Пліса, Уша, Уса, Свіслач (справа). Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Рэжым Б. характарызуецца веснавым разводдзем з сярэдзіны сак. да пач. мая ў верхнім цячэнні, да канца мая ў ніжнім цячэнні, малой водпасцю ў жніўні і верасні. Сярэдні гадавы расход вады каля Барысава 39,7 *м³/сек*, каля Бабруйска 119 *м³/сек*, каля Светлагорска 138 *м³/сек*. Унутрыгадавое размеркаванне сцёку нераўнамернае: каля 50% у перыяд веснавога разводдзя (сак.— май), у летне-асенні сезон (чэрв.— ліст.) 35 і зімой (снеж.— люты) 15%. Асенні крыгаход пачынаецца ў канцы ліст. (10—15 дзён). Ледастаў з пач. снежня да сярэдзіны красавіка. Суднаходная на працягу 544 *км* (ад в. Брады Мінскай вобл. да вусця). Гал. прыстані: Крайцы, Барысаў, Бярэзіно, Бабруйск, Светлагорск. Патэнцыяльныя гідраэнерг. рэсурсы Б. пры сярэднім шматгадовым расходзе вады 35 800 *квт*.



Рака Бярэзіна ў сярэднім цячэнні.

Найб. стараж. стаянкі і паселішчы чалавека ў бас. Б. адносяцца да эпохі неаліту (5—3-е тысячагоддзі да н. э.) і бронзавага веку (канец 3— пач. 1-га тысячагоддзяў да н. э.): Заценне, Вялікі Стахаў, Чарняўка, Брадзец (Мінская вобл.), Любонічы, Рыдлё (Магілёўская вобл.), Скалка (Гомельская вобл.) і інш. Найб. гарады — Бабруйск (1-я пал. 14 ст.), Барысаў (1125), Светлагорск (1961). На Б. адбываліся важныя ваен. падзеі. У час Паўночнай вайны 1700—21 шведская армія Карла XII у 1708 абышла з Пд рус. атрад Гольца, які знаходзіўся ў Барысаве. 14(25) чэрв. Карл XII адцягнуў яго ўвагу манеўрамі, пераправіўся цераз раку каля Бераэіна і рушыў на Магілёў. У Айчынную вайну 1812 армія Напалеона I, адступаючы з Масквы, 14—16(26—28) ліст. перапраўлялася цераз Б., каля в. *Студзёнкі*. На зах. беразе перабраліся толькі невялікія рэшткі варожых войск. У сав.-польскую вайну 1920 па Б. праходзіла лінія фронту і адбываліся жорсткія баі (гл. *Бярэзінскія аперацыі 1920*). У выніку Беларускай аперацыі 1944 сав. войскі разбілі на Б. гал. сілы групы армій «Цэнтр» фаш. Германіі.

Літ.: Гидроэнергетические ресурсы Белоруссии, Мн., 1957; Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии, в. 1 — Памятники каменного века, Мн., 1968.


У. В. Салаганаў (гідраграфія). Мінск.


БЯРЭЗІНА (Заходняя Бярэзіна), правы прыток Нёмана. Даўж. 226 *км*. Пачынаецца на паўн. схілах Мінскага ўзв., праразае ў скразной даліне Ашмянскае ўзв., дя-











Бярэзінскі запаведнік I.

1. Бярозавы ўзлесак. 2. Высакародныя алені. 3. Медзведзяня. 4. Возера Плаўна. 5. Рачны бабёр.







Бярэзінскі запаведнік II.

1. Качкі над возерам Палік.
2. Хвоі ў субары каля в. Бедзіна.
3. Белыя буслы.
4. Ласяня.
5. Марэнныя валуны каля в. Крайцы.

чэ па Нёманскай нізіне. Вадазбор (4000 *км*²) на У ўзгорысты, на З — плоская, месцамі забалочаная раўніна. Даліна Б. шырокая, рэчышча звілістае, шыр. 10—30 *м*. Гал. прытокі: справа Гальшанка, злева Іслач. Ледастаў з ліст.— снеж. да сак.— крас., сярэдняя працягласць 4 месяцы. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое, расход вады ў вусці каля 33 *м*³/*сек*. У ніжнім цячэнні Б. выкарыстоўваецца пры меліярацыі. Суднаходная на працягу 45 *км* ад в. Бакшты да вусця.

БЯРЭЗІНСКАЕ, пасёлак у Гарадзілаўскім с/с Маладзечанскага р-на Мінскай вобл., на Бярэзіне. За 22 *км* на ПдЗ ад Маладзечна, 97 *км* ад Мінска, 9 *км* ад чыг. ст. Палачаны. Аўтобусная ст. і чыг. прыпынак. 2 тыс. ж. (1970). Торфабрыкетны з-д, буд.-мантажнае ўпраўленне, камбінат быт. абслугоўвання. Прафесійна-тэхн. вучылішча тарфянікаў, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, паліклініка, аптэка, дзіцячыя сад і яслі, 2 сталовыя, 7 магазінаў. Помнік У. І. Леніну.

БЯРЭЗІНСКАЕ АБЛЕДЗЯНЕННЕ (окскае, другое нижнеантрапагенавае, міндэльскае, абледзяненне 2-й паловы старажытнай эпохі), другое абледзяненне на тэр. Беларусі. Ад самага старажытнага варажскага аддзяляецца белавежскім міжледавікоўем. Бярэзінскі ледавік укрываў амаль усю тэр. Беларусі, акрамя крайняга ПнУ. Паўднёвая мяжа (паводле М. М. Цапенка і Б. М. Гурскага) праходзіць на Пд ад Пінска, Старобіна, на У ад Жыткавіч, Лельчыц, на Пн ад Мазыра, праз Калінкавічы, на Пд ад Добруша па Злынку.

У ледавіковым комплексе водналедавіковыя і марэнныя адклады. Апошнія пашыраны ў сярэдняй палосе, на поўначы яны амаль размыты. Складзены з валунных супескаў і суглінкаў з лінзамі пяску і жвіру. На Пд рэспублікі ў марэне шмат адорвеняў неагенавых, палеагенавых і мелавых парод. Падысподнія і покрыўныя водналедавіковыя адклады, што сфарміраваліся ў перыяды наступання і адступання ледавіка, складзены з розназярністых слаістых пяскоў, тонкіх супескаў, стужкавых глінаў. Магутнасць тоўшчы бярэзінскіх адкладаў ад 2—3 *м* да 100 *м* у дабярэзінскіх далінах і паніжэннях.

Літ.: Цапенко М. М. и Махнач Н. А. Антропогеновые отложения Белоруссии, Мн., 1959; Лукашев К. И. Генетические типы и фации антропогеновых отложений Белоруссии, у кн.: Материалы по антропогену Белоруссии, Мн., 1961.

Р. І. Лявіцкая. Мінск.

БЯРЭЗІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЗАПАВЕДНІК, знаходзіцца ў паўн. частцы БССР, на тэр. Лепельскага і Докшыцкага р-наў Віцебскай вобласці і Барысаўскага Мінскай вобл. Адм. ц. Крайцы. Засн. 30.1.1925. Адзін з першых запаведнікаў, арганізаваных у гады Сав. улады. Створаны для аховы адзінай у той час на захадзе СССР калоніі рачных баброў у верхнім цячэнні р. Бярэзіны. Запаведнік (тэр. 76 000 *га*) займае Лепельска-Полацкую ўпадзіну ўздоўж верхняга цячэння р. Бярэзіны (левы бераг). Рэльеф пераважна раўнінны з невялікімі ўзвышшамі і ўзгоркамі ў паўн. частцы (ад 120 да 250 *м* над узр. м.) і нізінамі на Пд. Клімат умераны, вільготны. Сярэднегадавая т-ра 5, максімальная 33, мінімальная —40 °С. Вегет. перыяд каля 185 дзён. Снег выпадае ў ліст., ляжыць да пач. красавіка. Сярэдняя таўшчыня снегавога покрыва 20—40, у снежныя зімы да 50—75 *см*. Ападкаў да 640 *мм* за год, найб. у вегет. перыяд. Клімат спрыяе росту шматлікіх відаў дрэў, хмызняковай і травяністай расліннасці. Тэр. запаведніка мае густую гідраграфічную сетку. Гал. водная артэрыя — р. Бярэзіна, цячэ з Пн на Пд (80 *км*). У межах запаведніка каля 70 яе прытокаў. Усе яны забалочаныя, вясною разліваюцца і затапляюць на некалькі кіламетраў шырокую пойму Бярэзіны. У запаведніку шмат азёраў, самае вялікае — Палік (768 *га*) у паўд. частцы. Азёры Манец (108 *га*), Плаўна (296 *га*), Вольшыца (328 *га*) з Сяргуцкім і Бярэзінскім каналамі злучаюць Бярэзіну з Зах. Дзвіной і ўтвараюць адзіную водную сістэму, па якой у пач. 20 ст. сплаўлялі лес у Прыбалтыку. У цэнтр. частцы Б. дз. з. сцёкавае воз. Домжарыцкае, папаўняецца яно вадой з суседняга балотнага масіву. Пл. рэк і азёраў складае 2,5% тэр. запаведніка. Балотаў каля 18%. Глебы найб. дзярнова-падзолістыя, пясчаныя або супясчаныя, у паўд. ч.— дзярнова-падзолістыя сугліністыя, па берагах вадаёмаў тарфянабалотныя. Частыя выхады на паверхню марэнных адкладаў з валунамі і пясчана-галечных утварэнняў. Расліннасць разнастайная. Найб. пашыраныя дрэвавыя пароды: хвоя 42,3% лесапокрыўнай плошчы, бяроза — 23,2, чорная вольха — 18,2, елка — 11, асіна — 2,8, дуб — 0,42%. Расце таксама вольха шэрая (0,9%); збераглісяунікальныя для Беларусі чыстыя ясеневыя дрэвастоі 130—160-гадовага ўзросту (0,3%). Пл. лясоў складае 75%, прадукцыйнасць іх сярэдняя (III бонітэт). У падлеску: ляшчына, брызгліна, рабіна, крушына ломкая, маліна, чаромха, каліна, парэчкі чорныя і чырвоныя. Багатая меданосная расліннасць. У запаведніку больш за 50 відаў млекакормячых жывёл, 197 відаў птушак, 5 відаў паўзуноў, 10 відаў земнаводных. Жывуць капытныя, драпежнікі, грызуны, насякомаедныя, лятучыя мышы. Самы буйны прадстаўнік капытных — лось; колькасць гэтага віду найбольшая (1200 у 1969). Водзіцца казуля. У 1951 з Варонежскага дзярж. запаведніка ўпершыню завезены высакародныя алені. Пры падкормцы, закладцы кармавых палёў і саланцоў алені добра прыжыліся (у 1969 — 40—50 галоў). У запаведніку каля 1000 дзікоў. У снежныя зімы іх падкормліваюць бульбай, жалудамі, аўсом. Бярэзінскі дзік адрозніваецца ад зах. папуляцый гэтага віду большымі памерамі і павышанай жыццяздольнасцю. З грызуноў найб. цікавы рачны бабёр. Ціхія лясныя рэчкі, затокі, багатая водная расліннасць ствараюць добрыя ўмовы для баброў. З моманту ўтварэння запаведніка колькасць іх павялічылася ад 150 да 600—700. Каля 400 баброў адлоўлена для рассялення ў інш. рэспублікі і краіны.

У 1967 у запаведнік завезлі 5 зуброў з Белавежскай пушчы. Па ўзлесках, палянах, поймах рэк жыве заяц-русак, у лясах — вавёрка. Многа мышападобных грызуноў. Вядома 14 відаў драпежных жывёл. Самы буйны і рэдкі на Беларусі драпежнік — буры мядзведзь. Трапляецца рысь, колькасць яе рэгулюецца. Найб. пашыраны ліс і янотападобны сабака. У баравых мясцінах і на грудах селіцца барсук. Спрыяльныя ўмовы для лясной куніцы, тхара, гарнастая, ласкі. Па берагах рэк і азёраў водзяцца выдра і норка. Вядома 15 відаў лятучых мышэй, мноства птушак: глушэц, цецярук, белая курапатка, чорны бусел, журавель, скапа і інш. На азёрах, лясных рэчках, шматлікіх балотах жывуць вадаплаўныя: шэрая качка, крыжанка, чырок-свістунок, чырок-траскунок, гогаль. У час веснавых і асенніх пералётаў на воз. Палік адпачываюць вялікія чароды розных відаў качак. Птушыны свет запаведніка мае віды, якія не сустракаюцца ў гнездавы перыяд на Пд рэспублікі: арэхаўка, чыж, трохпальцы дзяцел і гіль. У вадаёмах лешч, язь, жэрах, плотка, акунь, шчупак, лінь, карась, судак, налім, мянтуз, рэдка сцерлядзь. Іл. гл. на ўклейцы.

В. дз. з. — жывая лабараторыя ў прыродзе, дзе вядуцца разнастайныя навук. даследаванні: батанічныя, лесагідралагічныя, заалагічныя. Праходзяць навуч. практыку студэнты ВНУ. Супрацоўнікі навук. аддзела запаведніка вядуць даследаванні па біялогіі лесу і жывёльнага свету ў іх узаемасувязях. Б. дз. з. — турысцкі край, вядомы сваёю прыродай, слаўнай партыз. гісторыяй. Непадалёку ад воз. Палік у Вял. Айч. вайну базіравалася каля 4000 партызанаў, размяшчаўся падпольны Барысаўскі райком партыі.


Літ.: Банников А. Г. По заповедникам Советского Союза, М., 1966; Ад вясны да лістапада. Бярэзінскі запаведнік. [Альбом], Мн., 1969; Сержанин И. Н. Государственный заповедник на реке Березине, Мн., 1947; Заповедник на Березине, Мн., 1966; Міхайлоўская В. Нарыс раслінасці Беларускага дзяржаўнага паляўнічага запаведніка, у кн.: Зборнік прац Ін-та біялогіі Беларускай АН, т. 3, Мн., 1933. *У. С. Раманаў.* Мінск.


БЯРЭЗІНСКІ КАНАЛ, частка Бярэзінскай воднай сістэмы ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Сістэма не дзейнічае. Б. к. злучае Бярэзіну з Зах. Дзвіной. Даўж. 8 *км*, шыр. 20—25 *м*, глыб. 0,4—0,8 *м*. Дно заіленае, зарастае. Пракапаны праз водападзел. Пралягае сярод дробнаўзгорыстай, часткова забалочанай мясцовасці і злучае азёры Плаўна і Бярэшча. Пабудаваны ў 1797—1805.

БЯРЭЗІНСКІ РАЁН, у складзе Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на У вобласці, па абодвух баках р. Бярэзіны. Пл. 1,9 тыс. *км*². Нас. 44 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 14 сельсаветаў. Раённы цэнтр г. Бераэіно.

Раён займае паўн. частку Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Паверхня раўнінная, злёгку хвалістая. Пераважаюць водналедавіковыя пясчаныя адклады, ёсць ледавіковыя валунныя суглінкі і супескі, па далінах рэк — азёрныя, рачныя і балотныя пясчаныя адклады. 2 радовішчы торфу — 13,7 млн. *т* (у т. л. Іванаўскае радовішча — 10,4 млн. *т*); 3 радовішчы цагельных глін — 1,3 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Глухі Ток — 0,9 млн. *м*³), ёсць невялікія радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу. Сярэднія т-ра студз. ад −6,5 да −7 °С, ліп. 18—18,5 °С. Ападкаў за год 640 *мм*. Вегет. перыяд 187 дзён. Па тэр. раёна цячэ Бярэзіна з прытокамі Уша і Уса (справа), Брусята і Клява (злева). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (52,2%), дзярнова-падзолістыя часова залішне ўвільготненыя (14,6%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя і глеевыя (9,7%), дзярнова-глеяватыя і дзярнова-глеевыя (4,4%), алювіяльныя і тарфяна-балотныя (19,1%). З мінер. глебаў 24,6% суглінкавых, 69,1% супясчаных, 6,3% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: worных зямель — 45 (цана бала 0,20 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 21, усіх с.-г. угоддзяў — 37. Лясы (мяшаныя, пераважаюць хваёвыя) займаюць 49% тэр. У лясах водзяцца ліс, казуля, лось, вавёрка; трапляюцца мядзведзь, дзік, выдра. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія і інш. Шчыльнасць нас. 23 чал. на 1 *км*², гарадскога 15%.

Да Кастр. рэвалюцыі быў толькі бровар. У 1970 — 14 прамысл., будаўнічных і транспартных прадпрыемстваў, размешчаных пераважна ў г. Бераэіно. З-ды: спіртавы (спірт, крухмал фугованы), пладова-агародніны (кансервы, безалкагольныя напіткі і інш.), торфабрыкетны імя XXIII з'езду КПСС, маслазавод; камбінаты: прамысловы (піламатэрыялы, цэгла, швейна-галантар. вырабы, мэбля)






Палац культуры ў вёсцы Мачаск.

і быт. абслугоўвання; раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, спецыялізаванае адда. Сельгастэхнікі і інш. У раёне 12 калгасаў і 12 саўгасаў (1970).

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» *(Арэшкавічы)*, «Бярэзіна» *(Браднец)*, «Гвардзеец» *(Чыжаха)*, імя XXII з'езду КПСС *(Міхалёва)*, імя Ільіча *(Сяліба)*, «Ленінскія дні» *(Лешніца)*, імя Мічурына *(Новая Падваложка)*, «Памяць Леніна» *(Мацевічы)*, «Перамога» *(Якшыцы)*, «Саюз» *(Высокая Гара)*, «Світанне» *(Вязькуцін 2-і)*, «Чырвоная Беларусь» *(Багушэвічы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Баравіно» *(Лагі)*, «Бярэзінскі» *(Косайка)*, «Высакагорскі» *(Высокая Гара)*, «Вяшэўскі» *(Вяшэўка)*, «Дзмітравічы» *(Дзмітравічы)*, «Камунар» *(Пагост)*, «Любушанскі» *(Любушаны)*, «Мачаск» *(Мачаск)*, «Паплавы» *(Паплавы)*, «Першамайскі» *(Мікулічы)*, «Сцяг Кастрычніка» *(Бераэіно)*, «Уша» *(Котава)*.


С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і бульбаводстве. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 40% тэр. раёна. Асушана 7,5 тыс. *га* (на пач. 1970). Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) 48,5, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 22,3, бульбай 8,9, тэхнічнымі 2,5, кармавымі 14,5. На пач. 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 34,9 (у т. л. кароў 17,9), свіней 34,5, авечак і коз 2,7. Па тэр. раёна праходзяць аўтамаб. дарогі: Мінск — Бераэіно — Магілёў, Бераэіно — Клічаў, Бераэіно — Бобр і інш. На пач. 1970 у раёне было 16 сярэдніх, 24 васьмігадовыя, (з іх 1 школа-інтэрнат), 42 пач. школы, 13 дзіцячых садоў, 41 масавая б-ка, 41 клубная ўстанова, 43 кінаўстаноўкі (у т. л. 31 стацыянарная), 6 бальніц, 22 фельч.-ак. пункты. У раёне (1970) 466 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 65 інжынераў, 30 аграномаў, 19 заатэхнікаў, 18 вет. урачоў, 234 настаўнікі, 30 урачоў; 1069 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Сцяг Леніна». *А. С. Ахінчыц.* Мінск.

Меліярацыйныя работы ў саўгасе «Паплавы».



БЯРЭЗІНСКІЯ АПЕРАЦЫІ 1920, наступальныя аперацыі войск Заходняга фронту Чырв. Арміі на р. Бярэзіне ў маі і ліпені 1920 у час савецка-польскай вайны.

1) На пач. мая Зах. фронт (камандуючы М. М. Тухачэўскі, чл. РВС І. С. Уншліхт, нач. палітаддзела К. І. Шутко, А. Ф. Мясніковў) размяшчаўся: Паўн. група войск займала рубеж Апочка — Дзісна — Янаполле (на ПнЗ ад Віцебска), 15-я армія (камандуючы А. І. Корк, чл. РВС М. С. Ціхменеў) — на ПдУ ад Лепеля; 16-я армія (камандуючы М. У. Салагуб, чл. РВС А. Э. Даўман) — па Бярэзіне. Часці Зах. фронту павінны былі распачаць контрнаступленне супраць польскіх войск у сярэдзіне мая. У падмацаванне Зах. фронт атрымаў больш за 40 тыс. байцоў, для вядзення палітработы сярод байцоў накіраваны тысячы камуністаў. На пач. наступлення сав. войскі Зах. фронту мелі 92,4 тыс. чал.; польскія арміі на гэтым участку — каля 60 тыс. Польскае камандаванне рыхтавала наступленне на 17.5.1920. Аднак 15-я армія і Паўн. група Зах. фронту пачалі наступленне 14 мая, каб сарваць планы ворага, разбіць войскі левага крыла 1-й польскай арміі (ген. Жалігоўскі), 4-й арміі (ген. Шаптыцкі) і адціснуць іх да Пінскіх балотаў. 16 мая сав. войскі выйшлі на рубеж Дзісна — Зябкі, 18 мая — Лужкі — Глыбокае; 15-я армія фарсіравала Бярэзіну. 16-я армія, затрыманая перагрупоўкамі, пачала наступленне на Мінскім напрамку толькі 19 мая. Польскае камандаванне перакінула на Зах. фронт каля 3 рэзервовых дывізій



і 2 дывізіі з Укр. фронту. 16-я армія фарсіравала Бярэзіну, але не здолела развіць наступленне і 23—26 мая была адкінута на першапачатковы рубеж. 31 мая польскае камандаванне распачало контрудар, каб акружыць і знішчыць 15-ю армію. Устойлівым супраціўленнем сав. войск план быў сарваны. Да 8.6.1920 фронт стабілізаваўся на лініі Зах. Дзвіна — воз. Вялікая Ельня — Зябкі — р. Бярэзіна. Гэтая аперацыя сарвала планы далейшага наступлення польскіх войск на У, прымусіла выкарыстаць асноўныя рэзервы, спыніць наступленне на Украіне, дала магчымасць сав. войскам заняць лепшыя пазіцыі для новага наступлення.

2) Ліпеньская аперацыя была падрыхтавана лепей і праведзена з вялікім поспехам. Яна з'явілася часткай агульнага наступлення Чырв. Арміі, якое пачалося 4.7.1920. 16-я армія 7.7.1920 фарсіравала Бярэзіну на фронце 45 *км* на Пд ад Барысава (гл. схему), 10 ліп. вызваліла Бабруйск, 11 ліп.— Мінск; памагла паспяхова выканаць асн. задачы 3, 4, 15-й армій.

Літ.: Тухачевский М. Н. Поход на Вислу, Избр. произв., т. 1, М., 1964; Кузьмин Н. Ф. Крушение последнего похода Антанты, М., 1958; Шиловский Е. Контрнаступление Красной Армии в Белоруссии, М., 1940; Сяргееў Е. 4-я Чырвоная Армія ў баях за вызваленне Савецкай Беларусі ў 1920 годзе, «Бальшавік Беларусі», 1935, № 10—11. *Н. В. Каменская.* Мінск.

БЯРЭСЦЕ (у летапісах Берестье), старажытная назва г. *Брэста*. Мяркуюць, што паходзіць ад слова «бераст» (мясцовая назва вяза) ці ад «бяроста» (кара бярозы).

БЯРЭШЧА, возера, вытак р. Бярэшчы, левага прытока р. Эсы (бас. Улы), у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 4,08 *км*². Даўж. 2,4 *км*, найб. шыр. 1,8 *км*, сярэдняя 1,7 *км*. Схілы катлавіны спадзістыя, укрытыя мяшаным лесам і хмызняком. Дно плоскае, услана ілам таўшчынёй да 5—6 *м*. Вадазбор (127 *км*²) дробнаўзгорысты, нізінны. Зарастае. У воз. ўпадаюць р. Кеста, канал Бярэзінскі. Водзяцца плотка, шчупак, карась, лешч, акунь.

БЯСЕДАВІЧЫ, вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Беседзь (1,5 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 4 *км* на ПдЗ ад Хоцімска, 200 *км* ад Магілёва, 45 *км* ад чыг. ст. Камунары. 746 ж., двароў 268 (1970). Васьмігадовая і бач. школы, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

БЯСКАТАВА, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 18 *км* на ПнУ ад Гарадка, 55 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Гарадок, каля шашы Гарадок — в. Мяжа (500 *м*). 71 ж., двароў 25 (1970). Васьмігадовая школа, аддз. сувязі, магазін.

БЯСКІЛЕВЫЯ ПТУШКІ, гл. *Птушкі-бегуны*.

БЯСКРЫЛАЯ ГАГАРКА (Pinguinus impennis), вымерлая птушка атрада чысцікавых.

БЯСПЛОДНАСЦЬ, няздольнасць дарослага арганізма даваць патомства.

Можа быць абсалютная, з прычыны глыбокіх незваротных змен у арганізме, і адносная, калі яе можна ліквідаваць. У жанчын Б. бывае першасная, калі яны раней не цяжарэлі, і другасная — пасля цяжарнасці. Б. у мужчын звязана з паталагічнымі зменамі семя або хваробамі і недахопамі развіцця семявыводных шляхоў; бывае таксама пасля ганарэі і туберкулёзу. Прычыны Б. ў жанчын: няправільнае развіццё ўсяго арганізма і полавых органаў, парушэнні дзейнасці нечнікавай і інш. залоз унутранай сакрэцыі, нястача ў арганізме вітамінаў, хранічныя запаленчыя хваробы і пухліны, аборты, вельмі кіслае асяроддзе похвы і інш. Лячэнне накіравана на ліквідацыю прычыны Б.: пры недаразвітасці полавых органаў і парушэннях дзейнасці эндакрынных залоз — гармонатэрапія, вітамінатэрапія, хірургічнае лячэнне; пры запаленчых працэсах — антыбіётыкі, сульфаніламідныя прэпараты, біягенныя стымулятары, грязелячэнне, электралячэнне. Папярэджвае Б. засцярога ад венерычных хвароб і абортаў.

Літ.: Иванов А. А. Бесплодие (этиология, диагностика, терапия, профилактика), у кн.: Многотомное руководство по акушерству и гинекологии, т. 4, кн. 2, М., 1963; Розовский И. С. Диагностика бесплодия, М., 1961; Порудоминский И. М. Бесплодие у мужчин, Л., 1964; Давыдов С. Н. Причины бесплодного брака, М., 1967. *П. І. Касько.* Мінск.

БЯСПОЛАЕ РАЗМНАЖЭННЕ, размнажэнне жывёл і раслін без апладнення. Асн. віды: дзяленне асобіны на дзве (бактэрыі, некат. прасцейшыя), спараўтварэнне (грыбы), шызаганія (малярыйны плазмодый), пачкаванне (дражджавыя грыбкі, раска, кішачнаполасцевыя), паўторнае папярочнае дзяленне (турбелярыі). У раслін адбываецца праз карэнішчы, паўзучыя парасткі, цыбуліны, дадатковыя пупышкі на каранях, клубні. Некат. арганізмам уласціва чаргаванне Б. р. і полавага. Параўн. *Полавае размнажэнне.*

БЯСПОЯСАЎ Яўлампій Мікалаевіч (н. ў сак. 1908, в. Анфімаўская Сольвычагодскага пав. Валагодскай губ.), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. У Чырв. Арміі з 1930. З ліст. 1941 камандзір партыз. групы, якая ў студз. 1942 увайшла ў склад 208-га партыз. атрада, камандаваў ротай. З 15.4.1943 камандзір партызанскага палка, які дзейнічаў у Магілёўскай і Пінскай абл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

БЯСПЯТАЎ Аляксей Іванавіч (н. 20.6.1920, станіца Прочнаакопская Кубанскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. Вызначыўся пры прарыве абароны праціўніка каля г. п. Шуміліна, у баях каля Бешанковіч, Лепеля, Докшыц Віцебскай вобл. Пры фарсіраванні Зах. Дзвіны арганізаваў і ўзначаліў групу салдатаў, якая пераправілася на левы бераг, захапіла і ўтрымала плацдарм да падыходу сав. часцей. Служыць у Сав. Арміі.

БЯССМЕРТНІКІ (і м а р т э л і), травяністыя расліны сям. складанакветных. Гл. *Сухацветы.*

БЯССМЕРТНЫ Аркадзь Львовіч [24.4(6.5). 1893, Сураж Віцебскай губ.— 3.9.1955], беларускі савецкі скрыпач, дырыжор, педагог. Засл. арт. БССР (1939). Скончыў Петраградскую кансерваторыю (1917). Быў другім скрыпачом у вядомым Мекленбургскім квартэце (ад імя яго заснавальніка рус. мецэната Г. Мекленбург-Стэрліцкага). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў першых на Беларусі сімф. аркестра і народнай кансерваторыі (1918) у Віцебску. Дырэктар Бел. муз. тэхнікума (з 1924). З 1926 скрыпач-саліст і дырыжор сімф. аркестра Бел. радыё. З 1932 педагог Бел. кансерваторыі (праф. з 1946). Стваральнік і ўдзельнік (першая скрыпка) Дзярж. струннага квартэта БССР (1935). Узнаг. 2 ордэнамі.



БЯССОНАЎ Пётр Аляксеевіч [4(16).6.1827, Масква — 22.2(6.3).1898], рускі гісторык літаратуры, славіст, фальклярыст. Праф. Харкаўскага ун-та (1879). Сын свяшчэнніка. Скончыў гістор.-філал. ф-т Маскоўскага ун-та (1851). Працаваў у Вільні (1864—67), збіраў і вывучаў бел. фальклор. Акрамя прац па л-ры, выпусціў зб.: «Балгарскія песні» (1855), «Дзіцячыя песні» (1868), «Песні, сабраныя П. В. Кірэеўскім» (в. 1—10, 1860—74), «Песні, сабраныя П. М. Рыбнікавым» (ч. 1—4, 1861—67) і інш. Выдаў зб. «Беларускія песні» (1871), у які ўвайшлі валачобныя, юраўскія, куставыя, мікольскія, пятроўскія, купальскія, калядныя і масленічныя песні.

Літ.: Авадовский М. К. История русской фольклористики, т. 2, М., 1963, с. 173—175; Банадарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964, с. 142—145.

БЯССОННІЦА, парушэнне сну. Бывае пры арганічных (энцэфаліты, менінгіты, пухліны і траўмы галаўнога мозгу, дыэнцэфальныя сіндромы) і функцыянальных (неўрастэнія, псіхастэнія, істэрыя) хваробах цэнтр. перв. сістэмы; пры хваробах органаў дыхання, кровазвароту і інш.

У здаровага чалавека можа з'явіцца ад хвалявання, псіхічнага ўзбуджэння, цяжкіх перажыванняў, парушэння замацаванага рэфлексу на сон (змена месца, умоў і часу сну). Пры Б. чалавек з вечара доўга не засынае або прачынаецца сярод ночы; заснуўшы, бачыць яркія сны і кашмары; раніцай адчувае слабе стомленым.

Калі Б. выклікаюць арганічныя хваробы цэнтр. перв. сістэмы і ўнутраных органаў, лечаць асн. хваробу; пры функцыянальных расстройствах сну — псіхатэрапія, гіпноз, узнаўленне нармальнага рэжыму працы і адпачынку, прагулкі перад сном, водныя працэдуры, лякарствы на сон (барбаміл, барбітал, паксірон, веранал, медынал, адалін і інш.), ліквідацыя прычын, якія могуць спрыяць Б. (шум, святло).

Літ.: Вейн А. М. Гиперсомнический синдром, М., 1966; Давиденков С. Н. Нарколепсия, у кн.: Многотомное руководство по неврологии, т. 6, Л., 1960. *А. М. Гурленя.* Мінск.

БЯССПРЭЧНАЕ СПАГНАННЕ, вызначаны законам парадак спагнання сродкаў; у адрозненне ад грамада.-прававых спрэчак, якія разглядаюцца судом або арбітрам, правадзіцца па распараджэнні органаў дзярж. кіравання. Фін. органы маюць права спагнаць у бясспрэчным парадку ў даход дзярж. бюджэту з дзярж. прадпрыемстваў і гаспадарчых арг-цый пратэрмінаваную запазычанасць (нядоімку) па падатку з абароту, па адлічэннях ад прыбытку, па аплаце за асн. фонды і абаротныя сродкі, па фіксаваных плацяжах, а з кааператыўных прадпрыемстваў, грамадскіх арг-цый і калгасаў — не заплачаны ў тэрмін падаходны падатак.

БЯССЦЕКАВАЯ ВОБЛАСЦЬ, частка сушы з засушлівым кліматам, якая не мае сцёку паверхневых водаў у Сусветны акіян. Рэкі Б. в. цякуць ва ўнутр. моры і азёры або губляюцца ў пясках, саланчаках, не даходзячы да гал. рэк (напр., у Кулундзінскім стэпе і Паўн.-Усх. Казахстане). Толькі магутныя рэкі, сцёк якіх фарміруецца ў больш вільготных абласцях, могуць дасягнуць мора (р. Ніл), але ў межах Б. в. яны значна змяншаюць воднасць і не маюць прытокаў. Абломкавы матэрыял, які выносіцца рэкамі, нагрувашчваецца ў нізоўях у выглядзе сухіх дэльтаў і конусаў вынасу, утвараючы вялікія тоўшчы кантынентальных чырванаколерных адкладаў, што сустракаюцца ва ўсіх геал. сістэмах ад дакембрыю да антрапагену. Найб. вялікія Б. в. ў Афрыцы і Азіі. У СССР — Арала-Каспійская ўпадзіна з р. Волгай, Уралам, Амудар'ёй, Сырдар'ёй.

БЯСТУЖАЎ (псеўд. Марлінскі) Аляксандр Аляксандравіч [23.10(3.11).1797, Пецярбург — 7(19).6.1837], рускі пісьменнік, дзекабрыст. З дваран. З 1824 чл. Паўночнага т-ва дзекабрыстаў. Прыгавораны да смяротнай кары, заменена ссылкай у Якуцк. У 1829 пераведзены радавым на Каўказ. Загінуў у баі. Пачаў друкавацца ў 1818. З К. Ф. *Рылеевым* пісаў агітацыйныя антыўрадавыя песні і выдаваў альманах «Полярная звезда», дзе ў аглядах рус. л-ры адстойваў прынцыпы прагрэс. рамантызму. Аўтар лірычных вершаў, аповесцей і нарысаў.

Тв.: Соч., т. 1—2, М., 1958; Полное собрание стихотворений, Л., 1961.

БЯСТУЖАЎ-РУМІН Міхаіл Паўлавіч (1803—13.7.1826), дзекабрыст. На вайск. службе з 1818, падпаручнік. З 1823 актыўны дзеяч Паўд. т-ва дзекабрыстаў, служыў у *Бабруйскай крэпасці*. З С. І. *Мураўёвым-Апосталам* распрацаваў т. зв. Бабруйскі план паўстання, які прадугледжваў арыштаваць Аляксандра І і яго світу ў час прыезду ў Бабруйск для агляду войск, аб'яднаць 1-ю і 2-ю арміі, заняць Кіеў і пайсці на Маскву. План абмяркоўваўся на з'ездзе дзекабрыстаў у Кіеве ў студз. 1823 і на нарадах у Бабруйску, але не ажыццёўлены з-за непадрыхтаванасці. У 1824 Б.-Р. дамовіўся пра сумесныя дзеянні Паўднёвага т-ва з польскімі рэвалюцыянерамі. У 1825 садзейнічаў аб'яднанню Т-ва з'яднаных славян з Паўд. т-вам і кіраваў створанай «Славянскай» управай. Прыхільнік ліквідацыі самадзяржаўя і знішчэння царскай сям'і, сталў за ўстанаўленне рэспублікі. З Мураўёвым-Апосталам кіраваў паўстаннем Чарнігаўскага палка (29.12.1825—3.1.1826), склаў Пракламацыю і Катэхізіс, якія чыталіся перад

войскамі. Паводле прыгавору Вярх. суда павешаны.


Літ.: Гл. пры арт. *Дзекабрысты.*

БЯСХВОСТЫЯ ЗЕМНАВОДНЫЯ (Ecaudata, Anura), атрад земнаводных жывёл. Тулава шырокае, даўж. да 35 *см*; шыя не выражана, галава трохкутная, хвост бывае толькі ў лічынкавай стадыі. Канечнасці добра развітыя, заднія значна даўжэйшыя за пярэднія (прыстасаваныя да скачкоў). Вядома каля 1700 відаў, аб'яднаных у 12 сямействаў. У СССР 23 віды, у БССР 10. Найб. пашыраны травяная, вастрамордая, сажалкавая і азёрная жабы, шэрая і вялёная рапухі, чырванабрухая жарлянка. Кормяцца насякомымі, лічынкамі камароў, дробнымі ракападобнымі. Б. з. пераважна сухапутныя (толькі прадстаўнікі сям. піпавых жывуць у вадзе). Самкі большасці Б. з. кладуць у ваду ікру (з выгляду падобную да рыбінай), з якой вылупліваюцца апалонікі. У многіх відаў адзначаны складаныя формы клопату пра патомства і пераход да размнажэння не ў водным асяроддзі. Большасць Б. з. карысныя (знішчаюць шкодных насякомых), некаторыя — аб'ект промыслу. Гл. таксама *Земнаводныя, Жабы, Жарлянкі.*

БЯСЦЭННЫ Віктар Мікалаевіч (н. 20.7.1924, пас. Макеевўка Арцёмаўскай акр.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1950. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся 15.10.1943 у баях каля Лоева Гомельскай вобл. Рота пад камандаваннем Б. фарсіравала Дняпро, адкінула праціўніка на 700 *м* і забяспечыла пераправу батальёна. Жыве на радзіме.


БЯСЦЭНТРАВА-ШЛІФАВАЛЬНЫ СТАНОК, металарэзны станок для вонкавага і ўнутранага шліфавання абразіўным інструментам паверхняў вярчэння. Бываюць аўтаматычныя і паўаўтаматычныя. Тонкім шліфаваннем можна атрымаць на вырабах паверхню высокай чысціні (8—9-га класаў).

На ўнутрышліфавальным Б.-ш. с. (рыс. 1,*а*) загатоўка *3* знаходзіцца паміж апорным *1* і прыціскным *2* ролікамі, вядучым кругам *5* і апрацоўваецца шліфавальным кругам *4*. Звонку загатоўкі апрацоўваюць метадамі падоўжнай, папярочнай падачы і шліфаваннем да ўпору. Пры падоўжнай падачы (рыс. 1,*б*) загатоўка *3*, размешчаная паміж кругамі *1* і *2*, падтрымліваецца нажом *4*. Шліфавальны круг *1* круціцца з акружной скорасцю 30—40 *м/сек*, здымаючы з загатоўкі



Рыс. 1.

прыпуск (лішкі металу). Скорасць вядучага круга *2*, устаноўленага пад вуглом да восі шліфавальнага, 0,1—0,9 *м/сек*. Ён падае загатоўцы вярчальны рух і падоўжнае перамяшчэнне. Гэтым метадам шліфуюць гладкія цыліндр. вырабы (напр., ролікі падшыпнікаў) і цыліндр. ўчасткі найб. дыяметра ступеньчатых і фасонных дэталяў. Пры папярочным (уразным) шліфаванні загатоўка апіраецца на нож і круціцца без падоўжнага перамяшчэння, а вядучы ці шліфавальны круг падаецца да загатоўкі ў напрамку, перпендыкулярным да ле восі. Канічныя і фасонныя паверхні шліфуюць кругамі адпаведнай формы. Шліфаванне да ўпору робіцца пры апрацоўцы ступеньчатых загатовак. На Б.-ш. с. асабліва высокай дакладнасці (мадэль ЗВ-182), якія выпускае віцебскі станкабудаўнічы з-д імя Кірава (рыс. 2), загатоўкі (цыліндрычныя, канічныя) апрацоўваюць падоўжным і папярочным метадамі. *М. Ю. Пікус.* Мінск.



Рыс. 2.

БЯСЧБІННЕ, вёска ў Ваўкавіцкім с/с Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». 112 ж., двароў 30 (1970). За 33 *км* на ПдЗ ад Чавусаў, 26 *км* ад Магілёва, 21 *км* ад чыг. ст. Раста. Бібліятэка.

В

В, трэцяя літара беларускага, рускага, украінскага і некат. іншых славянскіх алфавітаў. Паходзіць з кірыліцкай В («ведзі»), што асталася ў спадчыну са стараж.-рус. мовы. У сучаснай бел. літ. мове абазначае звонкі губна-губны гук «в», які ў адрозненне ад рус. мовы не знаходзіцца ні ў якіх функцыянальных суадносінах з губна-зубным гукам «ф» і пасля галосных перад зычнымі, а таксама на канцы слоў пераходзіць у «ў» («галоўка», «саўгас», «дроў»).

ВААРАНДЗІ Дэбора Юльянаўна [н. 18.9 (1.10).1916, г. Выру], эстонская савецкая паэтэса. Засл. пісьменнік Эст. ССР (1957). Чл. КПСС з 1940. З сялян. Дзяцінства і юнацтва В. прайшло на в-ве Сарэма. З 1936 вучылася ў Тартускім ун-це. Друкуецца з 1940. Першы зб. «Пад палаючым небам» (1945). Сацыяліст. буд-ва ў Эстоніі, гістар. мінулае эст. народа — асн. тэмы зб. «Пад шум прыбою» (1948), «Ясным ранкам» (1950), «Вершы» (1953), «Летуценнік ля акна» (1959). Паэтэса-лірык, многія яе вершы і паэмы праслякнуты глыбокім грамадз. пафасам. Узнаг. 2 ордэнамі.

Тв.: Рус. пер.— Стихотворения и поэмы. М., 1956; Мечтатель у окна, М., 1960; Хлеб прибрежных равнин, М., 1967; Люди смотрят на море, Таллин, 1968.

ВАБІЧ, рака, левы прыток Друці (бас. Дняпра). Даўж. 74 *км*. Цячэ ў Кругляпскім, Шклоўскім і Бялыніцкім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (565 *км*²) — хвалістая раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 3,5 *м*³/*сек*.

ВАВЕРКА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Улада Саветаў». За 27 *км* на ПдЗ ад Ліды, 91 *км* ад Гродна, 14 *км* ад чыг. ст. Курган, на шашы г. п. Астрына — г. Ліда. 248 ж., гасп. 93 (1970). Малочны з-д, камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі.

ВАВЕРКІ (Sciurus), род млекакормячых жывёл атр. грызуноў. Даўж. цела да 29, хваста да 22 *см*. Водзяцца ў лясах Еўропы, Азіі і Паўн. Амерыкі. Усяго звыш 50 відаў. У СССР — 2, на Беларусі 1 від — звычайная В. (S. vulgaris). Летам мае кароткае рыжае футра, зімой мяккае, пушыстае, цёмнашэрае з бураватым адценнем; на брушку заўсёды белае. Вельмі пашыраны пушны звярок. Жыве ў дуплах ці шарападобных гнёздах (гайнах), пабудаваных на дрэвах з галінак і моху. Корміцца жалудамі, арэхамі ляшчыны, насеннем хвоі і елкі, грыбамі, ягадамі, часам насякомымі і яйцамі птушак. На зіму ежу запасае. У галодныя гады жывіцца пупышкамі хвойных дрэў, а найчасцей, шукаючы корму, мігрыруе. Штогод дае 1—2 прыплоды па 5—7 (да 12) дзіцянят.



Звычайная вавёрка.

Літ.: Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961.

ВАВІЛАВА ЗАКОН, вызначае пастаянства квантавага выхаду люмінесцэнцыі ў шырокім інтэрвале даўжынь хваляў узбуджальнага святла. Адкрыты С. І. *Вавілавым* і ляжыць у аснове тэорыі *люмінесцэнцыі.*

Пастаянства квантавага выхаду абумоўлена квантавай прыродай святла, хуткім пераразмеркаваннем энергіі ва ўзбуджаным электронным стане па вагальных і інш. падузроўнях і перадачай энергіі навакольнаму асяроддзю. В. з. выконваецца ў вадкіх і цвёрдых растворах, а для складаных малекул у газавай фазе не мае месца, што тлумачыцца захаваннем лішку вагальнай энергіі, набытай у акце паглынання святла. В. з. атрымаў тэарэт. тлумачэнне ў працах бел. вучоных Б. І. *Сцяпанава* і М. А. *Барысевіча.*

Літ.: Вавилов С. И. Выход флуоресценции растворов красителей в зависимости от длины волны возбуждающего света, Собр. соч., т. 1, М., 1954; Борисевич Н. А. Возбужденные состояния сложных молекул в газовой фазе, Мн., 1967; Степанов Б. И. Закон Вавилова, «Успехи физических наук», 1956, т. 58, в. 1. *А. М. Рубінаў.* Мінск.

ВАВІЛАВА — ЧАРАНКОВА ВЫПРАМЯНЕННЕ, электрамагнітнае выпрамяненне, якое ўзнікае пры руху зараджанай часцінкі ў рэчыве са скорасцю, большай за скорасць распаўсюджання святла ў гэтым асяроддзі. Адкрыта ў 1934 П. А. Чаранковым. Асн. ўласцівасці В.— Ч. в. вывучаны на доследах, прапанаваных С. І. Вавілавым. Тэорыя гэтай з'явы на аснове класічнай элект-

радынамікі была створана ў 1937 І. Я. *Там* і І. М. *Франкам*.

Скорасць распаўсюджання эл.-магн. поля ў рэчыве (гл. *Фазавая скорасць*) у выпадку В.—Ч. в. меншая за скорасць руху самой часцінкі. Гэта выклікае адрыў поля ад часцінкі, і ўсе атамы рэчыва на шляху рухомай часцінкі, якая перадае ім частку сваёй энергіі, пачынаюць выпрамяняць эл.-магн. хвалі. В.—Ч. в. строга пакіраванае: яно распаўсюджваецца ў выглядзе конуса з воссю, якая супадае з напрамкам руху часцінкі, і з вуглом θ пры вяршыні, які вызначаецца умовай $\cos\theta = \frac{c}{nv}$, дзе c — скорасць святла ў гэтым асяроддзі, n — паказчык пераламлення, v — скорасць часцінкі.

У фізіцы высокіх энергій шырока карыстаюцца чаранкоўскімі лічыльнікамі быстрых зараджаных часцінак. Тэарэтычна даказана магчымасць выкарыстання В.—Ч. в. для генерацыі мікрарадыёхваляў і паскарэння зараджаных часцінак. Адыгрывае важную ролю ў рашэнні некат. праблем астрафізікі, фізікі плазмы і тэрмаядз. рэакцый.

Літ.: Зрелов В. П. Излучение Вавилова — Черенкова и его применение в физике высоких энергий, ч. 1—2, М., 1968 (бібліягр.); Болсун А. И., Власов Р. А., Гронский В. К. и Федоров Ф. И. Эффект Вавилова — Черенкова для частиц со спинами в гиротропных средах, «Весці АН БССР. Сер. фіз.-матэм. навук», 1969, № 1. *В. К. Гронскі.* Мінск.

ВАВІЛАЎ Максім Андрэевіч [27.7(9.8).1903, Полацк — 11.7.1960], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. (1955). З рабочых. Чл. КПСС з 1927. У Чырв. Арміі з 1924. Скончыў Аб'яднаную бел. ваен. школу імя ЦВК БССР (1927), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1948). За ўдзел у баях на воз. Хасан (1938) узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. У 1942—44 нач. штаба арміі Далёкаўсх. фронту. З 1944 у Ген. штабе Сав. Арміі. У 1954—56 нач. штаба Забайкальскай ваен. акругі; у 1956—59 у ваен.-навуч. установах. Узнаг. ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі.



ВАВІЛАЎ Мікалай Іванавіч [13(25).11.1887, Масква — 26.1.1943], савецкі батанік-раслінавод, генетык, селекцыянер, географ, адзін са стваральнікаў і арганізатараў с.-г. навукі ў СССР. Акад. АН СССР (1929, чл.-кар. 1923), акад. АН УССР (1929), першы прэзідэнт УАСГНІЛ (1929—35). Брат С. І. *Вавілава*. У 1910 скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т. З 1917 праф. Саратаўскага ун-та. Кіраўнік Усесаюзнага ін-та раслінаводства (УІР, 1924—40). Дырэктар Ін-та генетыкі АН СССР (1930—40). Прэзідэнт Усесаюзнага геагр. т-ва (1931—40). У 1922—40 арганізаваў экспедыцыі ў розныя раёны зямнога шара: СССР, Іран, Афганістан, Сірыю, Палесціну, Эфіопію, Японію, краіны Міжземнамор'я, Паўн., Цэнтр. і Паўд. Амерыку. З сабранага ім матэрыялу створаны сусв. калекцыі насення культурных раслін (больш за 200 тыс. узораў; зберагаюцца ў УІР). Стварыў вучэнне пра цэнтры паходжання культ. раслін, тэорыю гамалагічных радоў спадчыннай зменлівасці, распрацаваў тэарэт. асновы селекцыі, вызначыў лінеевускі від як складаную сістэму, звязаную паходжаннем з адпаведным асяроддзем. Для найважнейших культ. раслін зямлі вылучыў 95 аграэкалагічных абласцей і гэтым паказаў прыроду зменлівасці культ. раслін. Чл. ЦВК СССР (1926—35). Прэмія імя Леніна (1926), прэмія і медаль імя Пржавальскага (1929). Узнаг. ордэнам Леніна.

Тв.: Избр. произв., т. 1—2, Л., 1967.
Літ.: Жуковский П. М. Творческий путь Николая Ивановича Вавилова, «Ботанический журнал», 1958, т. 43, № 6; Библиографический указатель печатных работ академика Н. И. Вавилова, Л., 1967.




ВАВІЛАЎ Сяргей Іванавіч [12(24).3.1891, Масква — 21.1.1951], савецкі фізік і грамадскі дзеяч. Акад. АН СССР (1932, чл.-кар. 1931) і яе прэзідэнт з 1945. Дырэктар Фіз. ін-та АН СССР з 1932, навук. кіраўнік Дзярж. аптычнага ін-та ў 1932—45, гал. рэдактар 2-га выд. Вял. Сав. Энцыклапедыі з 1949. Стваральнік вялікай навук. школы оптыкаў, першы старшыня т-ва «Веды». Навук. працы па фіз. оптыцы. Распрацаваў асновы тэорыі люмінесцэнцыі, вывеў адзін з яе законаў (гл. *Вавілава закон*). З П. А. Чаранковым адкрыў *Вавілава — Чаранкова выпрамяненне*. Вырашыў шэраг прынцыповых пытанняў квантавай тэорыі інтэрферэнцыі, фізіял. оптыкі, паклаў пачатак развіццю нелінейнай оптыкі. Правадзіў даследаванні ў галіне філасофіі прыродазнаўства і гісторыі навукі. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—3-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1946, 1951 (пасмяротна). Узнаг. 2 ордэнамі Леніна і ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. У СССР установлены Залаты медаль імя Вавілава, які прысуджаецца раз у 3 гады за выдатныя працы ў галіне фізікі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М., 1952—56.
Літ.: Памяти Сергея Ивановича Вавилова, М., 1952; Левшин Л. В. Сергей Иванович Вавилов, М., 1960. *В. І. Сцяпанаў.* Мінск.

ВАВІЛОН (у шумерскай мове Кадынгіра, акадскай Бабілу, літар. вароты бога), старажытны горад на поўначы Двухрэчча, сталіца *Вавілоніі*. Упамінаецца з 2-й пал. 3-га тысячагоддзя да н. э. У 1-й пал. 2-га тысячагоддзя да н. э. палітычны і гасп. цэнтр Пярэдняй Азіі. З 8 ст. да н. э. ў складзе *Асірыі*. На мяжы 7—6 ст. да н. э. меў найб. рос-







Вавілонія.


1. Вароты Іштар у Вавілоне. Каля 570 да н. э. Рэканструкцыя.
2. Фантастычны звер і бык. Кафельныя выявы з варотаў Іштар.
3. Стэла ў гонар перамогі Нарамсіна. Каля 2300 да н. э.
4. Галава быка. Навершнік арфы з Ура. Сярэдзіна 3-га тысячагоддзя да н. э.
5. Медная галава з Ніневіі. 23 ст. да н. э.
6. Стэла з выявай Мардукапалідзіна, які абдорвае вяльможу. 715 да н. э.
7. Галава Гудэа. 22 ст. да н. э.
8. Зікурат Этэменанкі ў Вавілоне. Дойлід Арадахешу. Сярэдзіна 7 ст. да н. э. Рэканструкцыя.
























Візантыя. 1. Храм св. Сафіі ў Канстанцінопалі. Арх. Анфімій з Тралаў і Ісідар з Мілета. 532—537. 2. Царква манастыра св. Лукі ў Факідзе. 9 ст. 3. Абраз Уладзімірскай божай маці. Фрагмент. 1-я палова 12 ст. 4. Баптыстэрый праваслаўных у Равене. Інтэр'ер. Сярэдзіна 5 ст. 5. Хрыстос Пантакратар. Мазаіка купала манастыра ў Дафні каля Афінаў. Фрагмент. 2-я палова 11 ст. 6. Хрыстос ускладае вянец на галаву імператара Канстанціна VII. Слановая косць. 913—959. 7. Шаўковая тканіна з выявамі слоноў. 10—11 ст. 8. Дэталь саркафага ў базіліцы Сант-Апалінарэ Нуова ў Равене. 6 ст. 9. Імператрыца Зоя, жонка Канстанціна IX Манамаха. Мазаіка храма св. Сафіі ў Канстанцінопалі. Фрагмент. 1042—55.









квіт. У 538 да н. э. В. захапілі персы, у 331 да н. э. войскі Аляксандра Македонскага. Да 2 ст. н. э. заняпаў.

ВАВІЛОНІЯ, рабаўладальніцкая дзяржава 19—6 ст. да н. э. на тэр. сучаснага Ірака. Займала тэр. сярэдняга і ніжняга цячэння рэк Тыгра і Еўфрата. Засн. пасля пранікнення ў Ніжнюю Месапатамію семіцкіх плямёнаў амарытаў, з якіх выйшла і 1-я вавілонская дынастыя цароў [19—16 ст. да н. э.].

У час праўлення Хамурапі [1792—1750 да н. э.] В. захапіла ўсё Паўд. Двухрэчча і стала адной з магутных дзяржаў Пярэдняй Азіі. Усталявалася моцная цэнтралізаваная дэспатыя. Гаспадарка была заснавана на ірыгацыйным земляробстве. Асн. фонд зямель належаў абшчынам. Існавала і прыватнае землеўладанне (цара, храмаў, буйной рабаўладальніцкай знаці). Развіваліся рамяство, гандаль. Рабства не атрымала значнага развіцця; гал. крыніцамі яго былі войны і пазыковая кабала. Вольнае насельніцтва падзялялася на паўнаправных і непаўнапраўных. Абшчыннае землеўладанне паступова распадалася. У 1518 да н. э. В. завалодалі вандроўныя плямёны касітаў. Гэта быў перыяд заняпаду В. Пасля часовага ўздыму ў цараванне Навухаданосара I [1146—1123 да н. э.] пачаўся перыяд заняпаду. аслаблення. В. падпадае пад уладу *Асірыі*. У канцы 2 — пач. 1-га тысячагоддзя да н. э. ў В. пранікаюць халдзейскія плямёны. У 626 да н. э. ўладу ў В. захапіў халдзейскі военачальнік Набапаласар, які ў саюзе з Мідыяй разбіў Асірыю. Утварылася Нова-Вавілонскае царства. Найвыш. росквіту дасягнула пры Навухаданосары II [604—562 да н. э.]. Войны з Егіптам і Іудзейскім царствам скончыліся перамогаю В. Вялося будаўніцтва (новы арх. комплекс Вавілона), развіваліся рамёствы, гандаль, ліхвярства. Вавілон стаў гал. гандл. цэнтрам Пярэдняй Азіі. Павялічылася колькасць рабоў, узмацнілася іх роля ў гаспадарцы. У 538 да н. э. В. завявана персідскім царом Кірам II, стала правінцыяй *Ахеменідаў дзяржавы*.

Вавілонскае мастацтва (у шырокім сэнсе) уключае ў сябе мастацтва, створанае народамі, якія жылі на тэр. Двухрэчча з 4-га тысячагоддзя да н. э. (дзяржавы Шумер, Акад і інш.), і мастацтва ўласна Ст. Вавілона. Умацаваныя паселішчы-гарады будаваліся на штучных узгорках (для засцярогі ад паводкі); у цэнтры ставілі храм і царскі палац і абносілі іх сцяной. Асн. буд. матэрыял — трыснёг, гліна, сырцовая і абпаленая цэгла. Будынкі, прамавугольныя ў плане, мелі плоскі дах, унутраны двор і глухую знадворную сцяну, у якой у храмах рабіліся прамавугольныя выступы і нішы. Будынкі аздабляліся мазаікай, рэльефамі, скульптурай. Ад старававілонскага перыяду абярэгліся дыярытавая стэла са зборам законаў і рэльефам цара Хамурапі, культавыя роспісы палаца ў Мары, тэракотавыя рэльефы з міфалагічнымі сцэнамі. У новававілонскі перыяд будаваліся палацы, храмы, абаронныя і ірыгацыйныя збудаванні. Пры Навухаданосары II горад Вавілон меў дакладную планіроўку і быў абкружаны трыма сценамі з 8 варотамі, якія былі названы імёнамі гал. багоў, з вежамі і ровам, напоўненым вадой. Паўн. вароты багіні Іштар, упрыгожаныя глазураванай цэглай з жоўтымі і белымі выявамі жывёл на сінім фоне, адкрывалі гал. магістраль горада — выбрукаваную чырвонымі і белымі плітамі свяшчэнную дарогу працэсій. Яна вяла да храма Эсагіла, прысвечанага богу Мардуку, і да *зіккурата* Этэменанкі — славутай «Вавілонскай вежы» (7 ст. да н. э., дойлід Арадахешшу). У адным з трох палацаў Навухаданосара размяшчаліся т. зв. «вісучыя сады Семіраміды», якія лічыліся ў старажытнасці адным з сямі цудаў свету. Яны былі пасаджаны на рознавышынных тарасах і арашаліся з дапамогай складанай сістэмы збудаванняў. Вядома высокаразвітае прыкладное мастацтва Вавілона (гліптыка, ткацтва). Іл. гл. на укл.

Літ.: Авдиев В. И. История древнего Востока, М., 1953; Никольский Н. М. Частное землевладение и землепользование в древнем Двуречье, Мн., 1948; Всеобщая история искусств, т. 1, М., 1956, с. 57, 66—67; Законы Вавилонии, Ассирии и Хеттского царства, «Вестник Древней истории», 1952, № 3—4.


В. І. Гарамыкіна, І. М. Ялатамцава. Мінск.

ВАВУЛІЦКАЯ ЦАРКВА, помнік драўлянага дойлідства 18 ст. Пабудавана ў 1737 у Вавулічах (Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл.). Вызначаецца строгасцю і лакапічнасцю аб'ёмаў, выразнасцю сілуэта. У плане — выцягнуты прамавугольнік [(*м*) 17,4×8,4]. Над цэнтр. часткай царквы — барабан на васьмівугольным пастаменце, завершаны шлемападобным купалам. Над гал. (заходнім) уваходам — хоры на слупах. Званіца больш позняга часу пабудавана асобна ад царквы на усходзе гал. ўваходу.

ВАГА, сіла, з якой цела ў выніку зямнога прыцяжэння дзейнічае на апору (ці падвес), што ўтрымлівае цела ад свабоднага падзення. В. прапарцыянальная масе цела і роўная сіле цяжару, калі цела і апора не рухаюцца адносна Зямлі. Мяняецца ў залежнасці ад становішча яго на зямной паверхні: В. цела прыкладна на 0,5% большая на полюсах, чым на экватары, што абумоўлена сціснутасцю і вярчэннем Зямлі. Гл. таксама *Бязважкасць*.

ВАГА, прылада для вызначэння масы ці вагі якога-небудзь цела. Падзяляюцца на рычажныя, спружынныя, гідрастатычныя, электронныя, радыеактыўныя і інш. Існуюць: лабараторныя (метралагічныя, аналітычныя і інш.), гандлёвыя і прамысловыя; транспартныя (аўтамабільныя, вагонныя, самалётныя), спецыяльныя (аўтаматычныя, кранавыя, дазіровачныя і інш.), аэрадынамічныя (вымяраюць сілу і моманты, якія дзейнічаюць на самалёт ці яго мадэль пры выпрабаванні ў аэрадынамічнай трубе).

Рычажная В. бывае раўнаплечая (метралагічная, *аналітычная вага*, узорная, тэхнічная) і нераўнаплечая (медыцынская, аўтамабільная, парцыённая, кранавая). Раўнаплечая (звычайна аднарычажная) вызначае з павышанай дакладнасцю масу невялікіх целаў (ад 10^{-3} *мг* да 10 *кг*). Пры ўзважванні маса цела ўраўнаважваецца такой жа масай гіраў. Нераўнаплечая (шматрычажная) вызначае масу вялікіх грузаў. Адносіны плячэй рычажнай сістэмы $1:n$, дзе n=10, 100, 1000 і г. д., гэта значыць, каб ураўнаважыць масу цела, патрэбна маса гіраў у столькі ж разоў меншая за масу цела. Спружынная В. вызначае вагу цела расцягненнем ці сціскананем стальной спружыны. Ручная спружынная В. ўжываецца ў быце. Гідрастатычная В. вызначае шчыльнасць цвёрдых целаў і вадкасцей на аснове закону Архімеда. Электронная В. — прылада з электроннай схемай для вызначэння масы целаў — бывае двух тыпаў: В. з вялікай дакладнасцю (напр., чатырохдыяпазонная на граничную нагрузку 1000 *мг* з мінімальнай цаной дзялення шкалы 1 *мкг*) і В. з вялікай грузападымальнасцю (напр., самалётная, у якой электрон. схема дазваляе зменшыць габарыты В.).




Рычажная нераўнаплечая вага.

ВАГАВЫ АНАЛІЗ, метад вызначэння колькаснага саставу рэчываў. Аснова яго — за-

кон захавання масы рэчыва пры хімічных рэакцыях.

В. а. заключаецца ў наступным: адважваюць пэўную колькасць рэчыва, якое даследуецца, і растваряюць яго; з раствору патрэбны кампанент асаджваюць у выглядзе простага рэчыва ці злучэння вядомага пастаяннага саставу. Атрыманы асадак аддзяляюць ад раствору, высушваюць, прагартоўваюць, узважваюць і вылічваюць колькасць кампанента ў працэнтах да масы. В. а. адрозніваецца працягласцю аперацый, але характарызуецца высокай дакладнасцю (да 0,02%). Ім шырока карыстаюцца для аналізу рудаў, сплаваў, арган. рэчываў. Гл. таксама *Аналітычная хімія*.

ВАГАЛЬНЫ КОНТУР, электрычны ланцуг, у якім могуць адбывацца электрычныя ваганні ў выніку перыядычнага пераходу энергіі з электрычнага поля ёмістасці ў магнітнае поле індуктыўнасці.



Найпрасцейшы В. к. складаецца з індуктыўнасці L, ёмістасці C і актыўнага супраціўлення R (гл. рыс.). У В. к. пры адсутнасці знешніх уздзеянняў і страт энергіі адбываюцца *ўласныя ваганні* з кругавой частатой $\omega_0 = \frac{1}{\sqrt{LC}}$. Страты энергіі прыводзяць да затухання: амплітуда ваганняў памяншаецца. Знешняе ўздзеянне (перыядычнае эл. напружанне) выклікае ў В. к. *вымушаныя ваганні* з частатой ω гэтага напружання. Пры супадзенні частаты ω з ω_0 настае *рэзананс*: амплітуда рэзка павялічваецца. В. к. шырока выкарыстоўваецца ў радыётэхніцы. Гл. таксама *Аб'ёмны рэзанатар*.

ВАГАЛЬНЫЯ РУХІ ЗЯМНОЙ КАРЫ, гл. *Рухі зямной кары*.

ВАГАНАВА Агрыпіна Якаўлеўна [12(24).6.1879—5.11.1951], руская савецкая балерына, педагог, балетмайстар. Нар. арт. РСФСР (1934). У 1897—1916 салістка Марыінскага т-ра (т-р імя Кірава), у 1921—51 педагог, з 1943 праф. Ленінградскага харэагр. вуч. (посіць яе імя). Стваральніца пед. сістэмы, якая атрымала шырокае прызнанне ў СССР і за мяжой (выкладзена ў працы «Асновы класічнага танца», 1934). Сярод вучняў: Г. Уланава, М. Сямёнава, Н. Дудзінская, бел. артысткі З. Васільева, Н. Младзінская, В. Дудко. Дзярж. прэмія СССР 1946. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ВАГАННІ, працэсы, у якіх стан сістэмы (або цела) дакладна ці прыблізна паўтараецца праз аднолькавыя прамежкі часу і сістэма пры гэтым праходзіць праз становішча раўнавагі. Вельмі важная асаблівасць В.— магчымасць аб'яднаць разнастайныя В. ў групы, кожная з якіх апісваецца аднолькавымі дыферэнц. ўраўненнямі і вызначаецца аднымі і тымі ж ваганамернасцямі. Гэта дазваляе шырока выкарыстоўваць метады мадэлявання пры даследаванні новых з'яў і канструяванні розных тэхн. прыстасаванняў на аснове вагальных працэсаў. Такая універсальнасць В. спрыяла вылучэнню іх у асобную навук. дысцыпліну — тэорыю В.

Паводле фіз. прыроды В. падзяляюцца на механічныя (В. маятніка, струны, розных канструкцый), электрамагнітныя (В. ў *вагальным контуры, аб'ёмным рэзанатары, хваляводзе*), электрамеханічныя (В. мембраны тэлефона, п'езакварцавага выпрамяняльніка ультрагуку) і інш. Кінематычны падыход дзеліць усе В. на перыядычныя і неперыядычныя. Перыядычнымі паз. В., калі значэнне фіз. велічыні, якая мяняецца ў працэсе В., паўтараецца праз аднолькавы прамежак часу (перыяд В.). Найпрасцейшыя перыядычныя В. — *гарманічныя ваганні*. Паводле асаблівасцей узнікнення адрозніваюць *аўтавагання, вымушаныя ваганні* і *ўласныя ваганні*. У залежнасці ад тыпу дыферэнц. ураўненняў, якія апісваюць В., адрозніваюць лінейныя В. і нелінейныя. В. грузу, падвешанага на спружыне, пры адсутнасці знешняй сілы апісваюцца ўраўненнем

$$\frac{d^2x}{dt^2} + 2h\frac{dx}{dt} + \omega_0^2 x = 0, \qquad (1)$$

дзе x — адхіленне грузу ад стану раўнавагі, $2h = k/m$ — адносіны каэфіцыента супраціўлення асяроддзя k да масы грузу m, ω_0 — кругавая частата В. Пры $h = 0$ ураўненне (1) мае рашэнне $x = A\cos(\omega_0 t + \alpha)$, дзе A — *амплітуда* В., α — пачатковая *фаза*, t — час. Пры $h > 0$ ураўненне (1) апісвае *затухальныя ваганні*, а пры $h < 0$ — сістэму з «адмоўным трэннем» (маятнік Фруда, лямпавы генератар і інш.).

В. не астаюцца лакалізаванымі, а распаўсюджваюцца ў тым асяроддзі, дзе знаходзіцца іх крыніца. Працэс распаўсюджвання В. наз. *хвалямі*. Калі на вагальную сістэму дзейнічае перыядычная сіла, частата змены якой супадае з частатой уласных В. сістэмы, то настае *рэзананс*. В. маюць вялікае значэнне ў прыродзе і тэхніцы. Розныя віды В. вывучаюцца ў такіх раздзелах фізікі, як механіка, акустыка, электрычнасць, оптыка, тэорыя атама і інш.

Літ.: Бабаков И. М. Теория колебаний, 3 изд., М., 1968; Стрелков С. П. Введение в теорию колебаний, 2 изд., М., 1964.

М. П. Халімановіч. Мінск.

ВАГАРШАН (сапр. Пагасян) Вагарш Багданавіч [2(14).2.1894, Шуша — 6.5.1959], армянскі савецкі акцёр, рэжысёр, драматург. Нар. арт. СССР (1954). Праф. (1946). Чл. КПСС з 1944. У 1915 пачаў творчую дзейнасць. З 1923 у 1-м Дзярж. т-ры Арменіі (т-р імя Сундукяна, Ерэван). Мастацтва В. вызначалася глыбінёй думкі, шырынёй абагульненняў. З роляў: Ягор Булычоў («Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага), Гагік («Краіна родная» Д. Дэмірчана), Гамлет («Гамлет» У. Шэкспіра), Арбенін («Маскарад» М. Лермантава). Стварыў вобраз У. І. Леніна («Чалавек з ружжом» М. Пагодзіна). Аўтар п'ес «У кольцы» (паст. 1930), «Ванкадзор» (паст. 1945) і інш. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1952. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Арутюнян С. Вагарш Богданович Вагаршян, М., 1956.

ВАГІФ Мала-Панах (каля 1717—1797), азербайджанскі паэт і дзярж. дзеяч. З сялян. Вучыўся ў духоўнай школе. Ведаў перс. і араб. мовы, фальклор, вывучаў класічную ўсх. л-ру. Быў пастаўнікам, пасля везірам — міністрам замежных спраў карабахскага правіцеля. Выступаў за збліжэнне з Расіяй. Забіты новым правіцелем Карабаха Мухамедбекам Джэваншырам. Узбагаціў азерб. л-ру фальклр. традыцыямі, замацаваў у паэзіі ашугскую форму гашма, шырока выкарыстоўваў нар. мову. Пісаў лірычныя вершы («Журавы», «Фіялка»), творы філас. зместу («Я праўды шукаў»), выкрываў феадалаў, асуджаў прыгнёт («Паглядзі», «Не бачыў»).

Тв.: Рус. пер.— Лирика, М., 1968.

ВАГНЕР (Wagner) Вільгельм Рыхард (22.5.1813, Лейпцыг — 13.2.1883), нямецкі кампазітар, дырыжор, музычны пісьменнік. Працаваў хормайстрам, потым дырыжорам оперы ў многіх гарадах, у т. л. ў Рызе (1837—39), Дрэздэне (1842—49), дзе ўдзельнічаў у майскім паўстанні 1849. Пасля вымушанай эміграцыі жыў з 1864 у Мюнхене, з 1872 у Байрэйце; тут у 1876 адкрыты спец. т-р для пастаноўкі яго опер. Вялікі рэфарматар оперы, стваральнік муз. драмы, таленавіты паэт-драматург (лібрэтыст усіх сваіх опер), муз. публіцыст і тэарэтык муз. т-ра, заснавальнік (побач з Г. Берліёзам) сучаснага мастацтва дырыжыравання. У аснову оперных рэформы, ідэйная канцэпцыя якой сфарміравалася пад уплывам рэвалюц. настрояў 40-х г., В. паклаў характэрны рамант. эстэтычны прынцып сінтэзу мастацтваў. Поўнае зліццё слова, драм. дзеяння і музыкі абвясціў адзіным шляхам да стварэння ўсенар. «мастацтва будучыні», паабаўленага ўсіх вагаў бурж. цывілізацыі. Пафас непрымірымасці капіталіст. гр-ва выяўляецца ў літ. творах В., дзе выкладаецца тэорыя муз. драмы («Мастацтва і рэвалюцыя», 1849; «Мастацкі твор будучыні», 1850; «Опера і драма», 1851), і ў маст. увасабленнях сіл зла, карыслалюбства і крывадушнасці, якія процістаяць у яго операх вобразам узвышанай лірыкі і гераікі. Сюжэтныя матывы для манумент. драм В. браў пераважна з айч. міфаў і паданняў і, апрацоўваючы іх, раскрываў у алегарычнай форме трагедыю сучаснага яму жыцця. У светапоглядзе і творчасці В. адбіліся многія супярэчнасці рамантызму. У позніх эстэт. і публіцыст. працах пераважаюць рэакц. тэндэнцыі, якія паўплывалі і на ідэйны змест муз. твораў, у т. л. і тэтралогіі «Пярсцёнак нібелунга». В.-кампазітар быў больш паслядоўны барацьбіт за перадавое мастацтва, чым В.-публіцыст, філосаф, драматург. У лепшых творах эпічны размах, шчодрая маляўнічасць спалучаюцца з псіхалаг. экспрэсіўнасцю і філас. глыбінёй музыкі. Цалкам адмаўляючыся ад традыц. падзелу оперы на нумары, зліваючы рэчытатыўна-дэкламацыйны пачатак з арыёзным, В. стварыў новы своеасаблівы тып опернай мелодыкі («бясконцая мелодыя»). Разам з ёю скразному разгортванню музыкі садзейнічае арк. партыя, гібкая тканіна якой заснавана на перапляценні разнастайных лейтматываў. В. першы выкарыстоўваў разітую сістэму лейтматываў. Узбагаціў аркестр новымі гучаннямі, упёс у гармонію незвычайныя мадуляцыі, храматызмы, складаныя акордавыя комплексы. Нягледзячы на некат. крайнасці пры ажыццяўленні сваёй рэформы (аслабленне дынамікі сцэніч. дзеяння з-за перагрузкі арк. партыі лейтматывамі, якія растлумачваюць сэнс кожнага моманту, і інш.), В. зрабіў велізарны ўклад не толькі ў муз.-тэатр. культуру, але і ў сімф. музыку. Арк. эпізоды з опер (увертзюры, уступы, антракты, карціны) шырока выконваюцца на канцэртнай эстрадзе.



Тв.: 13 опер, у т. л. Лятучы галандзец (паст. 1843), Тангейзер (паст. 1845), Лаэнгрын (паст. 1850), тэтралогія Пярсцёнак нібелунга (муз. драмы Золата Рэйна, 1854; Валькірыя, 1856; Зігфрыд, 1871; Гібель багоў, 1874; паст. ўсёй тэтралогіі 1876), Трыстан і Ізольда (паст. 1865), Нюрнбергскія майстарэінгеры (паст. 1868), Парсіфаль (паст. 1882); 7 п'ес да «Фаўста» І. В. Гётэ (1832); сімфонія (1832), увертзюры; ідылія Зігфрыд (1870) для малога сімф. аркестра; хоры, рамансы, фп. п'есы.

Літ. тв.: Рус. пер.— Моя жизнь. Мемуары, т. 1—4, СПб., 1911—12 (назва т. 4 — Письма. Дневники. Обращение к друзьям); Избранные статьи, М., 1935.

Літ.: Грубер Р. И. Рихард Вагнер, М., 1934; Серов А. Н. Избранные статьи, т. 2, М., 1957, с. 480—506; Стасов В. В. Избр. соч., т. 3, М., 1952, с. 485—758; Чайковский П. И. Музыкально-критические статьи, [2 изд.], М., 1953, с. 302—330; Капп Ю. Рихард Вагнер. Биография, пер. с нем., М., 1913; Barth H. (Hrsg.) Internationale Wagner-Bibliographie. 1956—1960, Bayreuth, 1961.


ВАГНЕР Генрых Матусавіч (н. 2.7.1922, Жырардаў, Польшча), беларускі савецкі кампазітар. Засл. дз. маст. БССР (1963). На Беларусі жыве з 1939. Скончыў Бел. кансерваторыю па класах фп. (1948) і кампазіцыі (1954, у А. Багатырова). Адказны сакратар Саюза кампазітараў БССР з 1963. Найб. поспех В. прынеслі вакальна-сімф. паэма «Вечна жывыя» (1959), прысвечаная памяці ахвяр фашызму, балет «Святло і цені» (паст. 1963) па матывах рамана П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі», канцэрт для фп. з арк. (1964), тэлеопера «Ранак» (1967) па матывах паэмы А. Куляшова «Песня аб слаўным паходзе». Аўтар балетаў «Падстаўная пявеста» (паст. 1958), «Пасля балю» (1968), Маладзёжнай сюіты для салістаў, хору і арк. (1954), сюіты для сімф. арк. (1957), вак. цыклу «Настроі», песень, хар. апрацовак нар. песень, музыкі да фільмаў і тэатр. пастановак. Творчасці В. ўласцівы пластычнасць і нац. акрэсленасць меласу, гукавая маляўнічасць, драматычна-напружанае развіццё муз. вобразаў.




Літ.: Нісневіч С. Генрых Вагнер, Мн., 1969.

Т. А. Дубкова. Мінск.


ВАГОН (англ. waggon), адзінка рухомага саставу чыгуначнага транспарту для перавозкі грузаў і пасажыраў. Складаецца з хадавой часткі (колавыя пары, буксы), рамы, кузава ці платформы, ударна-цягавых прылад і тармазоў. У СССР адрозніваюць В. шырокакалейныя (1525 *мм*) і вузкакалейныя (1060, 900 і 750 *мм*). Бываюць несамаходныя (перамяшчаюцца лакаматывамі) і самаходныя (*аўтаматрысы*, трансферкары, маторавагонныя секцыі). Паводле канструкцыі кузава і матэрыялу адрозніваюць В.



Рыс. 1. Вагон з купалам для агляду мясцовасці.



Рыс. 2. Васьмівосевы паўвагон.



Рыс. 3. Шасцівосевая цыстэрна для перавозкі нафтапрадуктаў.

суцэльнаметалічныя, з металічным каркасам кузава і драўлянай абшыўкай, а таксама зварныя і кляпаныя. В. групуюцца ў пасаж. і грузавыя паркі.

Пасажырскі парк: В. для перавозкі пасажыраў, паштовыя, багажныя, В.-рэстараны, а таксама спец. прызначэння (служебовыя, пуцевымяральныя, В.-лабараторыі, клубы). Пасаж. В. бываюць далёкіх рэйсаў, міжабласных і прыгарадных зносін. В. далёкіх рэйсаў мяккія і цвёрдыя, па плацкупейны — купіраваныя (2 ці 4 месцы ў купэ) і агульныя. В. міжабласных зносін маюць мяккія крэслы самалётнага тыпу. У турысцкіх поязда́х двухпавярховыя В.-салоны (рыс. 1). Пасажырскія В. абсталяваны прыстасаваннямі для ацяплення, прымусовай вентыляцыі, установкамі для кандыцыявання паветра і інш. З 1946 у СССР будуюцца толькі суцэльнаметалічныя пасажырскія В. На Бел. чыгунцы з суцэльнаметалічных В. далёкіх рэйсаў і міжабласных зносін сфарміраваны экспрэс «Беларусь» (Мінск — Масква) і інш. Да асобнай групы належаць В. гарадскога транспарту (*метро, трамвай*).


Грузавы парк: крытыя В., паўвагоны, платформы, цыстэрны, ізатэрмічныя і В. спец. прызначэння. У крытых В. перавозяць пакавальныя, высокакашто́ўныя грузы, збожжа, жывёлу. З 1959 у СССР выпускаюцца выключна чатырохвосевыя В. грузападымальнасцю 62 *т*, у некат. з іх рассо́ўны дах. Паўвагоны патрэбны пад сыпкія грузы (вугаль, руда, кокс, шчэбень, жвір). Кузаў адкрыты і разгрузачнымі люкамі. Выкарыст. шасцівосевыя паўвагоны грузападымальнасцю 94 *т* і васьмівосевыя (рыс. 2) грузападымальнасцю 125 *т*. Сыпкія пылаватыя грузы транспартуюць у чатырохвосевых паўвагонах-хоперах грузападымальнасцю да 50 *т*. На вялікіх металург. прадпр. выкарыстоўваюць для перавозкі сыпкіх матэрыялаў і руды паўвагоны-думкары, абсталяваныя пнеўматычным самаазвальным прыстасаваннем. На платформах транспартуюць дажамерныя, грувасткія і цяжкія грузы. Грузападымальнасць 20—62 *т*. Будуюцца з адкіднымі метал. бартамі і прыстасаваннямі для мацавання бярвення, слупоў, дошак. Пад цяжкія грузы выкарыстоўваюць многавосевыя платформы-транспарцёры (12, 16, 20 і больш восяў) грузападымальнасцю 130, 180, 230 і 300 *т*. Ізатэрмічныя В. прызначаны для перавозкі скарапсавальных прадуктаў (мяса, рыбы, масла, садавіны). Падзяляюцца на ледзянкі з лёдасалянным ахаладжэннем, рэфрыжэратары з халадзільнай устано́ўкай і эл. ацяпленнем. У цыстэрнах перавозяць вадкасці (нафту, бензін, алей, кіслоты). Нафтапрадукты транспартуюцца ў цыстэрнах з парай кашуляй (паскарае аліў грузу). Цыстэрны бываюць чатырох-, шасці- (рыс. 3), васьмівосевыя, аб'ёмам 60—100 *м*³. Да В. спец. прызначэння адносяцца В.-майстэрні, В. пажарных паязда́ў, снегаприбіральшчыкі, В. для перавозкі жывой рыбы, бітуму і інш. Для перавозкі грузаў на блізкую адлегласць на прамысл. прадпрыемствах, будоўлях, у рудніках і кар'ерах ужываюцца ваганеткі — невялікія вузкакалейныя чыг. В. Вагонабуд. з-ды ў СССР — Алтайскі, Днепрадзяржынскі, Калінінскі, Ленінградскі, Рыжскі і інш. Выраб пасаж. і грузавых В. высокамеханізаваны і масава-паточны. У Мінску — вагонарамонтны з-д імя Мяснікова (рамантуе пасаж. В.).

А. В. Косць. Мінск.

ВАГРАНКА, печ для выплаўкі вадкага чыгуну з чушкавага. Часам выкарыстоўваецца для плаўкі каляровых сплаваў, абпальвання вапняку і атрымання шлакаваты з расплаўленага шлаку.

Паводле канструкцыі В.— цыліндрычная шахтавая печ. Кажух зварваецца з ліставой сталі таўшч. 6—12 *мм*. Услрэдзіне футэруецца (муруецца) вогнетрывалай цэглай. Асн. часткі: горан — ніжняя частка выш. 400—600 *мм*, днішча ляжыць на 4 калонах; набіўны под (лешчадзь) нахілены ў бок чыгуннага лятка — адтуліны для выпуску вадкага чыгуну; па верхнім поясе горна размешчаны 4—8 адтулін (фурмаў), праз якія ў В. падаецца паветра. Фурмаў можа быць 1—3 рады. Ніжэй фурмаў на 100—150 *мм* у сценцы горна адтуліна для выпуску вадкага шлаку — шлакавы ляток. Частка В. ад горна да загрузачнага акна наз. шахтай, яе выш. 3—8 *м*. Верхняя частка печы — труба з іскрагасільнікам. Дыяметр В. ад 500 да 2100 *мм*, адпаведна прадукцыйнасць агрэгата ад 1 да 25 *т* чыгуну за гадзіну. Пры рабоце В. запаўняецца порцыямі (калошамі) шыхты. Метал. калоша складаецца з чушкавага чыгуну, чыгуннага і стальнога лому, метал. адходаў ліцейнай вытворчасці; паліўная — з коксу; калоша флюсу — пераважна з вапняку.

Вагранчны працэс пачынаецца з загрузкі і распылявання першай порцыі коксу, які запаўняе шахту на 0,7—1,0 *м* вышэй фурмаў. Калі ён разгарыцца, у В. па чарзе загружаюць металічную, паліўную і флюсавую калошы: метал. матэрыялаў 10% ад гадзінай прадукцыйнасці В., коксу 10—12, а флюсу 3—4% ад масы метал. калошы. Шыхта запаўняе печ да загрузачнага акна. Паслойная загрузка матэрыялаў робіцца з разлікам, каб за час выгарання верхняга слоя коксу халастой калошы метал расплавіўся, а кокс, які згарэў, змяніўся новым паліўным слоем. У горне вагранкі збіраецца вадкі чыгун і шлак.



Схематычны разрэз вагранкі:
1 — збіральнік; *2* — горан; *3* — шахта; *4* — труба; *5* — іскрагасільнік; *6* — загрузачная бодня; *7* — паветраправод; *8* — калонка.

Перыядычна адкрываюцца ляткі, чыгун і шлак выпускаюць з В.

Пашыраны коксагазавыя В., у якіх 20—40% коксу заменьваецца прыродным газам. Вадзяное ахаладжэнне плавільнага пояса зніжае расход *вогнетрывалых матэрыялаў*; унутраны дыяметр В. астаецца пастаянны, што забяспечвае стабільнасць вагранчнага працэсу. Каб павысіць т-ру вадкага чыгуну, паветра, што прадзімаецца ў В., награецца спачатку да 500 °С. Кісларод у вагранчным працэсе павышае т-ру чыгуну, памяншае расход коксу і колькасць серы ў метале. На сярэдніх і вялікіх В. усе працэсы механізаваны. В. з паветрападагравальнікам, ачышчальнымі прыстасаваннямі і механізаванай загрузкай шыхты ўстаноўлены ў ліцейных цэхах гомельскага з-да «Цэнтраліт», Мінскіх трактарнага і аўтамабільнага з-даў, у трубаліцейным цэху Магілёўскага металург. з-да імя Мяснікова і інш.

Літ.: Технология металлов и других конструкционных материалов, под ред. А. М. Дмитровича, Мн., 1968.

А. М. Дзмітровіч. Мінск.

ВАДА (вокіс вадароду), H_2O, найпрасцейшае ўстойлівае злучэнне вадароду з кіслародам. Грэч. назва hýdōr гідро, лац. aqua аква. Бясколерная (у тоўстым слоі блакітная) празрыстая вадкасць, без паху і смаку, *t* пл. 0 °С, *t* кіп. 100 °С, найбольшая шчыльн. 1000 *кг/м*³ пры 4 °С, пры павышэнні ці паніжэнні т-ры шчыльнасць памяншаецца. Асн. растваральнік. Хімічна актыўнае рэчыва: лёгка ўзаемадзейнічае з многімі металамі і неметаламі, солямі і вокіслами. Малекулы В. стойкія да нагрэву і распадаюцца пры т-ры вышэй за 1000 °С. Ізатопная разнавіднасць — цяжкая вада, дзе вадарод часткова ці поўнасцю замешчаны *дэйтэрыем* (HDO ці D_2O), у невялікіх колькасцях (каля 0,016%) змяшчаецца ў звычайнай В., адрозніваецца ад яе сваімі ўласцівасцямі і ўжываецца як запавольнік у ядз. рэактарах.

В.— самае пашыранае рэчыва ў прыродзе: каля 70,8% паверхні зямнога шара ўкрыта ёю. Існуе ў цвёрдым і вадкім станах і ў выглядзе пары. Заўсёды мае дамешкі (газы, мінер. солі і арган. рэчывы). Найб. чыстая В.— дажджавая і снегавая. У акіянскай В. соляў каля 3,5% (пераважна хлорыстага натрыю, магнію). Жорсткая В. мае вял. колькасць соляў кальцыю і магнію, у ёй дрэнна разварваецца агародніна, мыла дае мала пены, пры кіпячэнні ўтвараецца накіп. В. ўжываецца ва ўсіх галінах нар. гасп. (гл. *Водазабеспячэнне*). Прыродную В. ачышчаюць фільтраваннем праз пясчана-жвіровыя фільтры і абеззараживаюць хлараваннем. Найб. ачышчаную В. (дыстыляваную) атрымліваюць перагонкай.

Літ.: Вернадский В. И. Избр. соч., т. 4, кн. 2, М., 1960; Круговорот воды, М., 1966; Изотопный анализ воды, М., 1957.

ВАДАГРЭЙНЫ КАЦЕЛ, цеплаабменны апарат для награвання вады цеплынёй адпрацаванай пары ці топкавымі газамі.

В. к., якія ставяцца на ЦЭЦ, робяцца ў форме цыліндра. Услрэдзіне паміж трубамі з вадой пра-пускаецца гарачая пара; вада награецца да т-ры 150 °С. Катлы абсталёўваюцца кантрольна-вымяральнымі прыладамі. Для ацяплення памяшканняў, атрымання гарачай вады і пары, запарвання кармоў на фермах карыстаюцца В. к., у якіх вада да цячэ па трубах і награецца цеплынёй топкавых газаў. Працуюць на цвёрдым і вадкім паліве, маюць вадзяную помпу, манометр, вадамернае шкло, засцерагальны клапан. В. к. розных марак выпускаюць: Пінскі ліцейна-механічны, Бабруйскі мех. з-ды і Мінскі з-д ацяпляльнага абсталявання.

ВАДАЗБОР (вадазборны басейн), частка зямной паверхні, з якой сцякаюць паверхневыя або падземныя воды ў раку, канал ці ў возера, утвараючы сістэму іх жыўлення. Плошча паверхневага В. (вадазборная плошча) абумоўліваецца рэльефам мясцовасці і абмежавана водападзелам. Падземны В.— плошча, з якой прыцякаюць падземныя воды ў раку або ў свідравіну ці калодзеж пры адпампоўванні з іх вады; вызначаецца гідраізагіпсамі люстэрка падземных водаў. Межы падземнага і паверхневага В. звычайна не супадаюць.

ВАДАЛАЗНАЯ СПРАВА, падводныя работы (рамонт і падыманне затанулых суднаў, ачыстка фарватэраў рэк, пракладка кабеляў, будаўніцтва і рамонт гідратэхн. збудаванняў і інш.), якія выконваюцца ў вадалазным рыштунку.

Карыстаюцца мяккім і цвёрдым рыштункам, які надзяецца на вадалаза́ў (лёгкія касцюмы, скафандры), інструментам (эл., гідраўл., пнеўматычным), абсталяваннем для спуску, падымання і работы пад вадой (лябёдкамі, помпамі для падачы паветра і інш.). Вадалаз дыхае сціснутым паветрам, якое падаецца праз шлангі з паверхні ці з балона́ў, замацаваных за яго спінай. Мяккі рыштунак не засцерагае вадалаза ад ціску вады і ўжываецца пераважна для работ на глыб. не больш за 30 *м*. Цвёрды рыштунак успрымае ціск вады на сябе, што забяспечвае ўсляздзіне скафандра атм. ціск і гарантуе бяспеку вадалазу на глыб. да 200 *м*. Большай глыб. дасягаюць у *батысферах* і *батыскафах*. Для падводных даследаванняў і ратавання людзей карыстаюцца *акваланга́мі*. Каб папярэдзіць спецыфічныя хваробы (кесонную хваробу, атручэнне вуглекіслатой) і нішчасныя выпадкі, распрацаваны рэжымы работы пад вадой.

У Сав. Саюзе В. с. развіваецца з 1923, калі па ініцыятыве Ф. Э. Дзяржынскага на Чорным м. была арганізавана Экспедыцыя падводных работ спец. прызначэння. На Беларусі В. с. пачала ўкараняцца ў сувязі са стварэннем рачнога флоту пасля грамадз. вайны. З 1957 усімі відамі вадалазных работ займаюцца арг-цыі ДТСААФ рэспублікі.

Літ.: Меренов И. В. Легководолазное дело, 2 изд., М., 1969; Единые правила охраны труда на водолазных работах, М., 1965; Годес Э. Г. В водных глубинах, Л., 1966.

ВАДАЛІЎ (лац. Aquarius), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Знаходзіцца ў паўд. паўшар'і неба. Яркіх зорак не мае. У сузор'і назіраецца самая вялікая на зямным небе планетарная туманнасць (вуглавыя памеры 12′). На тэр. БССР відаць з сярэдзіны лета і ўвосень. Гл. *Зорнае неба*.

ВАДАМЕР, гл. *Расходамер*.

ВАДАМЕРНЫ ПОСТ, прыстасаванне для вымярэння ўзроўню вады на рэках, морах, азёрах, каналах. Есць рэчныя В. п., у якіх рэйка з дзяленнямі назаўсёды прымацавана вертыкальна да моста, плаціны і інш., і свайныя В. п., дзе ўзровень вымяраецца па пераноснай рэйцы, якая ставіцца на сваю. Вымярэнні вядуцца кожныя суткі ў пэўныя для СССР прамежкі часу. На Беларусі 185 В. п. (1970), з іх 14 на азёрах, 80 з прыладамі-самапісцамі.

ВАДАНОСАЎ Мікола (Мікалай Міхайлавіч; н. 4.1.1923, Мінск), беларускі савецкі пісь-

меннік. З сям'і вайскоўца. У Айч. вайну радыст партыз. злучэння на Маладзечаншчыне. Скончыў Выш. літ. курсы ў Маскве (1959). Друкуецца з 1948. Выдаў кн. апавяд. і аповесцей «Першае знаёмства» (1954), «У Баркоўскай пушчы» (1956), «Аднагодкі» (1959), «Пабярэжцы» (1960), «Рачны госць» (1961), «Надзеі і здзяйсненні» (1963). Гумар. апавяданні ў кн. «Прыцыповы аратар» (1966). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Пераломнае лета, Мн., 1961; Апошні вадзянік, Мн., 1964; Хатабыч-малодшы, Мн., 1965; Здарэнне на Сцюдзёнцы, Мн., 1967; Адзінай маці сыны, Мн., 1968; Двайная памылка, Мн., 1969.

ВАДАНОСНЫ ГАРЫЗОНТ, слой горнай пароды, насычаны падземнай вадою. Вада фільтруецца па порах, пустотах або шчылінах паміж зернямі парод пад дзеяннем сілы цяжару або гідрастатычнага ціску. В. г. мае адзіную свабодную (безнапорны) або п'езаметрычную (напорны) паверхню. У падземнай гідрадынаміцы, шахтавай, нафтавай і прамысловай гідрагеалогіі В. г. называюць ваданосным пластом. Першы ад паверхні В. г. называюць гарызонтам *грунтавых водаў*. На Беларусі вылучаецца больш за 10 асноўных для водазабеспячэння В. г., якія аб'ядноўваюцца ў магутныя напорныя ваданосныя комплексы. З іх толькі В. г. крышталічных парод і антрапагенавых адкладаў пашыраны ўсюды. В. г. ў прамежкавай тоўшчы палеазойскіх і мезазойскіх адкладаў пашыраны лакальна.

ВАДАПЕРЫЦА (Hotonia), род водных шматгадовых травяністых раслін сям. першакветных. Сцябло падводнае, даўж. 15—45 *см*. Лісце грэбенепадобнае перыстарассечанае, размешчанае кальчаком. Кветкі буйныя белыя ці ружовыя ў гронкападобных суквецціях на бязлісцевым кветаносе. Плод — каробачка. Пасля апылення кветанос згінаецца, і насенне выспявае пад вадой. Вядомы 2 віды, пашыраныя ў Еўропе, М. Азіі і Паўн. Амерыцы. У СССР адзін від — В. балотная (бел. нар. назва вадзяны кураслеп). Расце ў стаячай вадзе, на балотах, у канавах, сажалках.

ВАДАРОД (Hydrogenium), H, хімічны элемент I групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 1, ат. м. 1,00797. Упершыню даследаваны ў 1766 англ. вучоным Г. Кавендышам. Найб. пашыраны элемент Сусвету: складае каля паловы масы Сонца і большасці зорак. На Зямлі яго доля 1% па масе, уваходзіць у састаў вады, усіх жывых арганізмаў, нафты, вугалю, торфу, прыродных газаў. Мае тры ізатопы: протый, *дэйтэрый* і *трытый*. В.— гаручы газ без колеру і паху, *t* пл. −259,2 °С, *t* кіп. −252,8 °С, шчыльн. 0,0899 *кг/м*³. Вельмі слаба растварэцца ў вадкасцях, значна лепш у некат. металах (Pd, Ni, Pt) пры высокай т-ры.


Існуе ў выглядзе дзвюх алатрапічных мадыфікацый орта- і паравадароду (3 : 1). У хім. злучэннях 1-валентны. Добры аднавіцель. Уступае ў рэакцыі пераважна пры награванні ці пры наяўнасці каталізатараў. У паветры ці ў кіслародзе чысты В. гарыць з утварэннем вады. Сумесь В. з кіслародам ці паветрам пры падпальванні выбухае. З галагенамі ўтварае галагенавадароды, з азотам — аміяк, з металамі — гідрыды, з вугляродам — вуглевадароды.

У прамысл. атрымліваюць няпоўным акісленнем і канверсіяй вуглевадародаў, электролізам вады, у лабараторыях — дзеяннем салянай к-ты на цынк. Выкарыстоўваюць у выт-ве аміяку, метанолу, гідрагенізацыі цвёрдага і вадкага паліва, тлушчаў і розных арган. злучэнняў, для гідраачысткі прадуктаў нафтаперапрацоўкі, пры зварцы і рэзцы металаў, а ізатопы яго — у ядзернай тэхніцы. В. не таксічны, але не падтрымлівае жыцця.

Літ.: Лебедев В. В. Водород, его получение и использование, М., 1958; Сиенко М., Плейн Р. и Хестер Р. Структурная неорганическая химия, пер. с англ., М., 1968.

С. В. Маркевіч. Мінск.

ВАДАРОДНАЯ БОМБА, сістэма, якая ўзрываецца ад імгненнага выдзялення вялікай колькасці энергіі пры рэакцыі сінтэзу ядраў ізатопаў вадароду. Асн. часткі В. б.: тэрмаяда. зарад, дэтанатар і абалонка. На тэрмаяда. зарад выкарыстоўваецца цвёрдае хім. злучэнне ізатопаў вадароду (дэйтэрыю і трытыю) з літыем — гідрыды літыю Li^6H^2 і Li^6H^3.




Вадародная бомба:
1 — дрот ад узрывальніка; *2* — дэйтэрыд літыю; *3* — зарад плутонію; *4* — крыніца нейтронаў; *5* — абалонка.

У выніку яда. рэакцыі паміж дэйтэрыем і трытыем выдзяляецца энергія ў 4 разы большая, чым пры дзяленні той жа масы ядраў урану. Рэакцыя сінтэзу патрабуе т-ры ў некалькі дзесяткаў млн. градусаў, таму тэрмаяда. зарад не мае крытычнай масы, як у *атамнай бомбе*. Дэтанатар — атамная бомба малога калібру. Абалонка В. б. робіцца з урану. Выбух атамнага зараду дэтанатара імгненна стварае тэмпературныя ўмовы для пранікання тэрмаяда. рэакцыі сінтэзу ізатопаў вадароду. Уранавая абалонка пры выбуху дадаткова выдзяляе яда. энергію і радыеактыўныя асколкі дзялення. Паражальнае дзеянне В. б. аднолькавае з атамнай бомбай той жа магутнасці. Створаны В. б., магутнасць якіх у сотні разоў большая за атамныя. Гл. таксама *Атамны выбух*.

Літ.: Гл. пры арт. *Тэрмаядзерная зброя*.

ВАДАРОДНАЯ СУВЯЗЬ, нехімічная сувязь паміж валентна насычанымі дадатна зараджаным атамам вадароду і адмоўна зараджаным атамам кіслароду, азоту ці фтору (радзей атамам інш. элемента).



Адрозніваюць міжмалекулярную (*а*) і ўнутрымалекулярную (*б*) В. с. Наяўнасць міжмалекулярных В. с. выклікае павышэнне т-р кіпення і плаўлення, анамальны рост шчыльнасці пры плаўленні лёду і інш., аднак мала ўплывае на хім. ўласцівасці рачываў. В. с. слабейшая за звычайную *хімічную сувязь*. Сустракаецца ў многіх хім. злучэннях (вада, кіслоты, шчолачы, спірты).

ВАДАРОДНЫ ПАКАЗЧЫК pH, велічыня, якая характарызуе канцэнтрацыю (актыўнасць) іонаў вадароду ў растворах і лікавая роўная адмоўнаму дзесятковаму лагарыфму гэтай канцэнтрацыі (актыўнасці): $pH = -\lg[H^+]$. Для чыстай вады pH=7 (нейтральнае асяроддзе), калі pH>7 — раствор шчолачны, pH<7 — кіслы. Пастаянства pH падтрымліваецца *буфернымі растворамі*. Вызначаюць В. п. электрахімічным спосабам ці з дапамогай індыкатараў.

ВАДАСПАД, падзенне вады з аднаго або некалькіх уступаў (каскадам) у рэчышчы. Уступы ўтвараюцца ў месцах, дзе рака сустракае цвёрдыя пароды, якія цяжка размываюцца. Вада разбурае дно, падмывае ўступ, які паступова перамяшчаецца ўверх па плыні. Самыя высокія В.— Анхель (1054 *м*) на р. Чуруп у Венесуэле, Ілья Мурамец (141 *м*) на в-ве Ітуруп (Курыльскія а-вы) у СССР, Вікторыя (120 *м*) на р. Замбезі ў Паўд. Афрыцы, Ніягарскі (51 *м*) на р. Ніягара ў Паўн. Амерыцы. Найб. шырокія В.— Вікторыя (1800 *м*), Ігуасу на адпайменнай рацэ ў сістэме Параны ў Бразіліі (больш за 3 *км*, з астравамі).

ВАДАСХОВІШЧА, штучны вадаём, створаны перагараджальнай плацінай ці напорным гідравузлом у даліне ракі, яра, цясніны. Пад В. выкарыстоўваюцца таксама катлавіны прыродных азёраў.

Робіцца для рэгулявання работы гідраэлектрастанцый, падтрымання суднаходных і лесасплаўных глыбіняў, водазабеспячэння і арашэння, рыбнай гасп., рэгулявання сцёку веснавых водаў (ахова ад паводкі). Уплывае на раслінна-жывёльны свет, мікраклімат, гаспадарку суседніх раёнаў; выклікае перафарміраванне берагоў, глебаў, павышае ўзровень грунтавых водаў. Шкодны ўплыў ліквідуецца рознымі інш. збудаваннямі і лесамеліярацыйнымі мерапрыемствамі. У рачных басейнах СССР пабудаваны В.: у Волжска-Камскім — 18, Дняпроўскім — 5, Обска-Іртышскім — 5, Енісейска-Ангарскім — 2. Найб. В.: Куйбышаўскае, Рыбінскае, Валгаградскае, Кахоўскае, Цымлянскае і інш.

На Беларусі створаны 45 адносна вялікіх і сотні дробных В. (найб.: *Заслаўскае вадасховішча* і *Асіповіцкае вадасховішча* на р. Свіслач). Ствараюцца (1970) В. *Вілейска-Мінскай воднай сістэмы*.

Літ.: Авакян А. Б. и Шарапов В. А. Водохранилища гидроэлектростанций СССР, 2 изд., М., 1968; Вопросы водохозяйственного строительства, Мн., 1968.

С. Х. Будыка. Мінск.

ВАДЗЯНАЯ ЗАРАЗА, водная расліна сям. жабнікавых. Гл. *Эладэя*.

ВАДЗЯНІК, персанаж міфалогіі славян і іншых, асабліва паўночных, народаў. Уяўляўся ў выглядзе старога з сівой ці зялёнай барадой як злы дух, які жыве ў вадзе і прыносіць людзям няшчасце. Вобраз В. пашыраны ў фальклоры народаў, працоўная дзейнасць якіх звязана з рачным і марскім промыслам. У былінах, рус., бел. і ўкр. казках В.— таксама марскі цар.

ВАДЗЯНОЕ АЦЯПЛЕННЕ, найбольш пашыраны від цэнтральнага ацяплення, у якім цепланосьбітам з'яўляецца вада. Вада награецца ў воданагравальных катлах, па трубах ідзе ў награвальныя прылады, якія даюць цяпло памяшканням, і зноў вяртаецца ў катлы. Пры вода-вадзяным ацяпленні вада награецца ў цеплаабменным апараце ці змешваецца з высокатэмпературнай вадой, нагрэтай да 120—150 °С, якая падаецца з ЦЭЦ ці з раённай кацельні. Пры пара-вадзяным ацяпленні цепланосьбіт награецца вадзяной парай у цеплаабменным апараце (бойлеры).

Адрозніваюць сістэмы В. а.: гравітацыйныя (з прыроднай цыркуляцыяй вады са скарасцю 0,2 *м/сек*) і помпавыя (скарасць руху вады 0,5—1 *м/сек*) з верхнім і ніжнім размеркаваннем нагрэтай вады, дзвюхтрубныя і аднатрубныя. У дзвюхтрубнай вада ідзе да прылад і адводзіцца ад іх па асобных стаяках (верт. трубах), у аднатрубнай — па адных і тых жа стаяках.

Літ.: Белинский Е. А. Рациональные системы водяного отопления, Л., 1963; Ковалевский И. И. Квартирное водяное отопление малоэтажных жилых зданий, М., 1968.

ВАДЗЯНОЕ КОЛА, рухавік з гарызантальнай (радзей вертыкальнай) воссю вярчэння, які прыводзіцца ў дзеянне рухам вады.

Асн. частка — вобад з лапаткамі ці каўшамі, якія злучаюцца спіцамі з валам. Ад вала магутнасць перадаецца з дапамогай зубчастых, раменных ці інш. перадач рабочым машынам. У залежнасці ад спосабу падводзвдзення вады адрозніваюць В. к. ніжнябойныя (падліўныя), сярэднябойныя і верхнябойныя (наліўныя). Магутнасць В. к. не большая за дзесяткі кілават, калі падліўнога — 0,30, наліўнога — 0,75. В. к.— старажытны мех. рухавік. Ужываўся ў сістэмах арашэння ў Егіпце, Асірыі, Індыі і інш. краінах. У сярэднія вякі ў Зах. Еўропе і на Русі выкарыстоўваўся як прывод для вадзяных млыноў. Гл. таксама *Гідраўлічная турбіна, Гідраўлічны рухавік*.

ВАДЗЯНЫ АРЭХ, рагулькі, чылім (Trapa), род водных аднагадовых травяністых раслін сямейства рагульнікавых. Сцябло тонкае, даўжынёй 60—120 *см*. Падводнае лісце

Заслаўскае вадасховішча.



лінейнае, рана ападае; пры аснове яго прыдаткавыя перыстыя воласападобныя карані. Надводнае лісце скурыстае, на доўгіх чаранках, у разетцы. Кветкі дробныя, белыя. Плод — арэхападобная каробачка бурага колеру з рагападобнымі выростамі. Вядома каля 30 відаў, пашыраных у вадаёмах умераных шырот амаль усяго зямнога шара. У СССР 25 відаў, у БССР адзін — В. а. плывучы (T. natans, нар. назвы: калёныя арэхі, каменныя арэхі). Плады ядомыя, багатыя на крухмал, бялок, цукар, алей. Імі кормяцца дзікія жывёлы. У Кітаі, Японіі, Індыі некат. віды В. а. культывуюцца як каштоўныя харч. расліны. У БССР В. а. ахоўваецца законам.



Вадзяны арэх плывучы: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — плод.

Літ.: Васильев В. Н. Водяной орех и перспективы его культуры в СССР, М.—Л., 1960.

ВАДЗЯНЫ ГАЗ, гл. *Газіфікацыя цвёрдага паліва.*

ВАДЗЯНЫ ПАЦУК (Arvicola terrestris), млекакормячая жывёла падсям. палёвак атр. грызуноў. Даўж. 13,5—21,5 *см*. Поўсць густая, на спіне рыжавата-бурая, па баках святлейшая з шэра-ржавым адценнем. Падобны на сапраўдных пацукоў, але мае хвост з валаскамі. Пашыраны ў Еўропе і Азіі (акрамя Усх. Сібіры і Сярэдняй Азіі). У СССР — у Еўрап. частцы, Зах. і Сярэдняй Сібіры, Казахстане. Жыве ў забалочаных поймах рэк, на балотах. Корміцца трыснягом, стрэлкалістам, хвашчом, малюскамі, насякомымі, дробнай рыбай і інш. Шкодзіць с.-г. культурам (бульбе, буракам, кукурузе). Пераносіць узбуджальнікаў тулярэміі. Шкуркі В. п. — другасортная пушніна. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Грызуны.*

Літ.: Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии. 2 изд., Мн., 1961.

ВАДЗЯНЫ ПЕРАЦ (Polygonum hydropiper), аднагадовая травяністая расліна сям. грэчкавых. Сцябло прамастойнае, часта чырванаватае, выш. да 70 *см*. Лісце вузкае ланцэтнае з залозістымі кропкамі і раструбам каля асновы. Кветкі дробныя ружовыя або зеленаватаружовыя, сабраныя ў коласападобныя гронкі. Плод — чорны арэшак. Расліна на смак пякуча-горкая. Пашырана ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. На Беларусі пар. назвы: вадзяная гарчыца, дрост, гарчак бабскі. Расце на топкіх берагах рэк, азёраў, сажалак, на вільготных лугах, па канавах. Лекавая. Прэпараты з В. п. ўжываюцца ў медыцыне.



Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ВАДКАСЦЬ, агрэгатны стан рэчыва, прамежкавы паміж цвёрдым і газападобным. Існаванне В. абмежавана з боку нізкіх т-р пераходам у цвёрды стан (крышталізацыяй), а з боку высокіх т-р пераходам у стан газу. В. маюць уласцівасці цвёрдых целаў і газаў. Напр., ізатропнасць і адсутнасць пэўнай формы (цякучасць), як у газаў, а высокая шчыльнасць, малая сціскальнасць і моцнае малекулярнае ўзаемадзеянне, як у цвёрдых целаў. Акрамя таго, рэнтгеналагічны аналіз паказвае, што размяшчаюцца малекулы В. не хаатычна, а наглядаецца т. зв. блізкі парадак — упарадкаванае адноснае размяшчэнне суседніх малекул В. ўнутры малых аб'ёмаў. Імавернасць знаходжання некат. малекулы В. ў дадзеным пункце яе аб'ёму залежыць ад таго, дзе знаходзяцца інш. малекулы. Такая імавернасная сувязь у размяшчэнні малекул В. колькасна выражаецца функцыямі размеркавання. Найб. простая з іх — радыяльная функцыя размеркавання $G(r)$ — характарызуе радыяльнае размяшчэнне часцінак аднароднай атамарнай В. Ведаючы $G(r)$ (з вывучэння рассеяння рэнтгенаўскіх прамянёў, нейтронаў і электронаў), можна ў прынцыпе знайсці ўраўненне стану В. і яе кінетычныя характарыстыкі.

Малекулы В. знаходзяцца ў цеплавых ваганнях каля становішчаў раўнавагі в сярэдняй частатой, блізкай да частаты ваганняў атамаў у крышталях, і амплітудай, якая вызначаецца «свабодным аб'ёмам», дазволеным ёй суседнімі малекуламі. Гэтыя становішчы раўнавагі імгненныя і нястойлівыя, таму ў В. мае месца самадыфузія і цякучасць. В. маюць толькі адну мадыфікацыю, выключаючы *вадкія крышталі* і *гелій*. Паверхня падзелу дзвюх фаз характарызуецца ў В. *паверхневым нацяжэннем*. На мяжы трох фаз (В. — газ — цвёрдае цела) наглядаецца з'ява намочвання (гл. *Паверхневыя з'явы*). Фенаменалагічна тэрмадынамічныя ўласцівасці В. апісваюцца ўраўненнем стану $p-f(T, V)$, якое звязвае ціск p в абсалютнай т-рай T і ўдзельным аб'ёмам V. Найб. простым з'яўляецца *Ван-дэр-Ваальса ўраўненне.*

Сучасная стат. тэорыя В. апісвае структуру В. і ўсе яе фіз. ўласцівасці наборам функцый размеркавання месца знаходжання груп часцінак. Асн. задача гэтай тэорыі В. — вывучэнне функцый размеркавання і атрыманне строгага ўраўнення стану.

Літ.: Боголюбов Н. Н. Проблемы динамической теории в статистической физике, М.—Л., 1946; Фишер И. З. Статистическая теория жидкостей, М., 1961.

В. В. Бокуць. Мінск.

ВАДКІЯ КРЫШТАЛІ, устойлівы стан некаторых рэчываў, прамежкавы па сваіх уласцівасцях між вадкім і крышталічным станамі. Утвараецца ў арган. рэчывах з выцягнутай формай малекул. Найчасцей сустракаецца ў араматычных злучэннях. Як і звычайныя вадкасці, В. к. цякучыя і ўтвараюць кроплі (сферычнай, прадаўгаватай і нават ступеньчатай формы), але аптычныя, электрычныя, магнітныя і інш. ўласцівасці іх анізатропныя, як ў цвёрдых крышталічных целаў.

Анізатрапія В. к. абумоўлена ўзаемнай арыентаванасцю малекул, а не будовай іх. Адрозніваюць 2 асн. структурныя разнастайнасці В. к.: смектычную, дзе паралельныя малекулы размяшчаюцца слаямі, і нематычную, дзе малекулы ўтвараюць ніткападобныя структуры. В. к. маюць выразна акрэсленую тэмпературную граніцу існавання. Напр., цвёрды крышталічны халестэрылбензаат пры т-ры 145 °С пераходзіць у вадкакрышталічны стан — з выгляду мутную вадкасць, якая пры 179 °С пераходзіць у звычайную празрыстую ізатропную вадкасць. Пры ахаладжэнні наглядаецца адваротны працэс. Гэтыя пераходы адбываюцца з паглынаннем ці выдзяленнем цеплыні, г. зн. з'яўляюцца фазавымі пераходамі. Вадкакрышталічныя рэчывы, як і інш. арган. злучэнні, даюць *гамалагічныя рады*. Вывучэнне В. к. мае вял. значэнне для біялогіі, тэхнікі і асабліва для медыцыны, бо многія арган. рэчывы чалавечага арганізма знаходзяцца менавіта ў стане В. к.

Літ.: Чистяков И. Г. Жидкие кристаллы, М., 1966.

Ф. К. Горскі. Мінск.

ВАДКІЯ МІНЕРАЛЬНЫЯ ЎГНАЁННІ, угнаенні, якія маюць спажыўныя элементы: азот, фосфар, калій і мікраэлементы ў водарастваральным стане.

Адрозніваюць вадкія азотныя ўгнаенні (ВАУ) і вадкія складаныя ўгнаенні (ВСУ). Да ВАУ належаць: водны аміяк (аміячная вада), мае каля 20% азоту; аміякаты (растворы соляў азоту), маюць 30—40% азоту; вадкі бязводны аміяк — самае канцэнтраванае ўгнаенне, мае каля 82% азоту, але нязручнае для ўжывання, бо трымаць яго трэба пад ціскам 30—35 *ат*. ВАУ прыгодныя пад усе с.-г. культуры. Ужываюць пераважна аміячную ваду. ВСУ, акрамя азоту, маюць фосфар, калій і мікраэлементы. Колькасць пажыўных рэчываў 24—40%. Іх лёгка захоўваць і выкарыстоўваць. У БССР В. м. ў. вырабляюць на Гродзенскім азотнатукавым заводзе.

Літ.: Агрохимия, 2 изд., М., 1967, с. 210—213, 339—341.

Х. М. Александровіч. Мінск.

ВАДКОЎСКІЯ, дзекабрысты, браты. З дваран Віцебскай губ.

Іван Фёдаравіч (1790 — г. см. невяд.), палкоўнік, камандзір батальёна ў Сямёнаўскім палку. За спачуванне салдатам у час паўстання 1820 прыгавораны да пакарання смерцю, якое заменена турэмным зняволеннем. Да 1826 у Віцебскай турме. З 1829 высланы ў дзейную армію на Каўказ.

Фёдар Фёдаравіч [1800 — 8(20).1.1844], вучыўся ў Маскоўскім універсітэцкім пансіёне (з А. С. Грыбаедавым). З 1822 карнет кавалергардскага палка, у 1824 за антыманархічныя вершы пераведзены прапаршчыкам у Нежынскі полк. Чл. Паўн. т-ва з 1822 і Паўд. т-ва з 1824. Стаяў за рэсп. лад у Расіі, за фіз. зніжэнне царскай сям'і. 9(21).12.1825 арыштаваны і засуджаны да кары смерцю, заменена пажыццёвай катаргай. З 1839 на пасяленні ў Іркуцкай губ. Аўтар рэвалюц. вершаў і музыкі да песні «Славянскія дзевы».

Аляксандр Фёдаравіч (1801 — пасля 1837), падпрапаршчык Сямёнаўскага палка. За спачуванне салдатам у час паўстання 1820 пераведзены ў Крамянчугскі полк, пазней у 17-ы Егерскі. Чл. Паўн. т-ва з 1823. У час паўстання Чарнігаўскага палка хацеў падняць свой полк у падтрымку, але па дарозе арыштаваны. Пасля 4-месячнага зняволення высланы ў дзейную армію на Каўказ. З 1830 пад наглядам паліцыі ў Тамбоўскай губ.

Тв.: у кн.— Избранные социально-политические и философские произведения декабристов, т. 3, М., 1951.

Літ.: Восстание декабристов. Материалы, т. 1, М.—Л., 1925; Довнар-Запольский М. В. Мемуары декабристов, Киев, 1906; Горбачевский И. И. Записки. Письма, М., 1963; Декабристы. Новые материалы, М., 1955; Декабристы. Неизданные материалы и статьи, М., 1925; Движение декабристов. Указатель литературы. 1928—1959, М., 1960.

М. Ф. Мельнікаў. Крычаў.

ВАДОЗНЫЯ ВОДЫ (ад лац. vadosus неглыбокі), падземныя воды знешняга атмасфернага паходжання, якія ўдзельнічаюць у кругазвароце вады на зямным шары. Проціпастаўляюцца *ювенільным водам.* Утвараюцца ад прасочвання (інфільтрацыі) атм. ападкаў у верхнія слаі зямной кары, часткова ад кандэнсацыі вадзяной пары і цыркуляцыі вады па порах, шчылінах і пустотах у горных пародах.

ВАДУЦ (Vaduz), сталіца *Ліхтэнштэйна.* На правым беразе Рэйна. Вузел аўтамаб. дарог. 4 тыс. ж. (1967). Невялікія прадпр. прыладабудавання, з-д штучных (фарфаравых) зубоў, выраб сувеніраў. Каледжы. Гістарычны і мастацкі музеі.

ВАЕЙКАЎ Аляксандр Іванавіч [8(20).5. 1842, Масква — 27.1(9.2).1916], рускі кліматолаг і географ, заснавальнік рускай кліматалогіі. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1910), д-р філасофіі (1865), д-р фіз. геаграфіі (1880), праф. (1885), засл. праф. Пецярбургскага ун-та (1912). Шмат падарожнічаў па Расіі (у 1891 — па Беларускім Палессі), Зах. Еўропе, Б. Усходзе, замежнай Азіі, Паўн. і Паўд. Амерыцы. Аўтар працы «Кліматы зямнога шара, у асабліваці Расіі» (1884), дзе ўпершыню ў сусв. метэаралогіі паставіў задачу высветліць сутнасць метэаралаг. з'яў і клімат. працэсаў. Засн. і рэд. «Метеорологического вестника» (з 1891). Навук. спадчына В.— больш за 1700 публікацый. Імем В. названа Гал. геафіз. абсерваторыя ў Ленінградзе.

Тв.: Избр. соч., т. 1—4, М.—Л., 1948—57.

ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНЫЯ ГРУПЫ (ВАГ), органы кіравання злучэннямі партыз. брыгад і асобна дзейных атрадаў у Вял. Айч. вайну на акупаванай тэр. Магілёўскай вобл. Створаны *Магілёўскім падпольным абкомам КП(б)Б* летам 1943 пры Быхаўскім, Бялыніцкім, Бярэзінскім, Кіраўскім, Клічаўскім, Круглянскім, Крычаўскім, Магілёўскім, Шклоўскім падпольных райкомах партыі. Праз ВАГ падпольныя райкомы і Магілёўскі абком КП(б)Б кіравалі дзейнасцю падпарадкаваных ім партыз. фарміраванняў.

ВАЕННАЕ МАЙСТЭРСТВА, састаўная частка ваеннай навукі, тэорыя і практыка падрыхтоўкі і вядзення ўзброенай барацьбы. Уключае *стратэгію, аператыўнае майстэрства* і *тактыку.*

В. м. зарадзілася з узнікненнем войнаў і армій. Моцны ўплыў на развіццё В. м. аказвае спосаб вытворчасці, які ўзаемнічае на яго праз эканам. структуру гр-ва, асабовы састаў узбр. сіл, узбраенне і баявую тэхніку. В. м. імперыялісц. дзяржаў развіваецца ва ўмовах іх агрэс. палітыкі, абвастрэння агульнага крызісу капіталізму.

Сав. В. м. склалася ва ўмовах сацыялісц. ладу; яно выкарыстала дасягненні сусветнага, асабліва рускага, В. м. Грунтуецца на марксісцка-ленінскай тэорыі пра вайну і

армію. Высокага развіцця дасягнула ў Айч. вайну. З'яўленне ядзернай зброі выклікала рэвалюцыю ў ваен. справе і закранула ўсе галіны В. м. Сав. В. м. выходзіць з таго, што будучая вайна можа быць ракетна-ядзернай. Аб'ектамі ўзбр. уздзеяння ў такой вайне стануць не толькі ўзбр. сілы на тэатрах ваен. дзеянняў, але і найважн. ваенна-эканам. і адм.-паліт. цэнтры на тэр. варожых дзяржаў. Асн. спосабам стратэгічнага ўздзеяння з'явіцца сакрушальныя ракетна-ядзерныя ўдары па гэтых аб'ектах. Развіццё сав. В. м. накіравана на далейшае ўмацаванне абароннай магутнасці СССР і краін сацыялізм. садружнасці.

Літ.: 50 лет Вооруженных Сил СССР. М., 1968.

Дз. К. Слепянкоў. Масква.


ВАЕННАЕ СТАНОВІШЧА, асобае становішча ў краіне ці асобных яе раёнах, якое ўводзіцца звычайна пры выключных абставінах (вайна, стыхійнае няшчасце) на падставе пастановы выш. органа дзярж. улады.

У СССР аб'яўляецца Прэзідыумам Вярх. Савета СССР у інтарэсах абароны краіны ці забеспячэння грамадскага парадку і дзярж. бяспекі. На час В. с. ўсе функцыі органаў дзярж. улады ў галіне абароны, забеспячэння грамадскага парадку і дзярж. бяспекі перадаюцца ваен. уладам. Устанаўліваецца адказнасць паводле законаў ваен. часу за парушэнне загадаў і распараджэнняў ваен. улад. Ва ўмовах В. с. ўсе прынцыпы сацыялізм. законнасці не трацяць сваёй сілы.

ВАЕННА-ІНЖЫНЕРНАЯ СПРАВА, галіна ваеннага майстэрства. Вызначае аб'ём, характар і спосабы выканання інжынерных мерапрыемстваў для забеспячэння бою ці аперацыі; асновы арганізацыі і выкарыстання *інжынерных войск* і іх узаемадзеяння са злучэннямі і часцямі інш. родаў войск і відаў узбр. сіл; распрацоўку канструкцый ваенна-інж. абудаванняў, сродкаў інж. узбраення і спосабаў іх выкарыстання ў баі і аперацыі. Мае на мэце інж. разведку мясцовасці і месца знаходжання праціўніка, забеспячэнне маскіроўкі войск і ваен. аб'ектаў, узвядзенне палявых абарончых і ахоўных збудаванняў, наладжванне ўзрыўных і неўзрыўных загарод і пераадоленне іх, падрыўныя работы, работы па буд-ве, рамонце і аднаўленні дарог і мастоў, наладжванне пераправ цераз водныя перашкоды і інш.

ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ (ВМФ), від узброеных сіл дзяржавы, прызначаны для ваен. дзеянняў на водных прасторах. ВМФ вялікіх дзяржаў складаецца з флотаў і флатылій, якія дзейнічаюць у час вайны самастойна ці ва ўзаемадзеянні са злучэннямі інш. відаў узбр. сіл. ВМФ капіталіст. дзяржаў — сродак агрэсіі супраць краін сацыялізм. лагера і краін, якія вядуць нац.-вызв. барацьбу.


Дэкрэт пра стварэнне Рабоча-Сялянскага Флоту Сав. Расіі падпісаны У. І. Леніным 29.1.1918. ВМФ Сав. Саюза складаецца з *Балтыйскага флоту, Паўночнага флоту, Ціхаакіянскага флоту, Чарнаморскага флоту, Каспійскай ваеннай флатыліі.* Узброены сучаснай перадавой ваен. тэхнікай, рознымі відамі ракетна-ядзернай зброі, надзейна ахоўвае інтарэсы краіны на морах і акіянах.



Баявы карабель у паходзе.

Мае падводныя лодкі, надводныя караблі, марскую авіяцыю, берагавыя ракетна-артыл. войскі і марскую пяхоту, судны дапаможнага флоту, службы і часці спец. прызначэння (разведкі, сувязі і нагляду і інш.).

Гал. сіла сучаснага ВМФ — атамныя падводныя лодкі і ракетаносныя авіяцыя. Надводныя караблі паводле свайго баявога прызначэння падзяляюцца на ракетныя, процілодачныя, артыл.-тарпедныя



Высадка баявога дэсанта.

(крэйсеры, эскадраныя мінаносцы, тарпедныя катэры і інш.), процімінныя, дэсантныя і інш. Ваенна-марскія і авіяц. базы ВМФ забяспечваюць стаянку, рамонт, матэрыяльна-тэхн. аснашчэнне баявых караблёў, іх баявую падрыхтоўку, адпачынак асабовага саставу. Задача ВМФ у час ваен. дзеянняў — наносіць ракетнай зброяй удары па важных ваен. і ваен.-прамысл. аб'ектах, знішчаць ваенна-марскія сілы праціўніка ў адкрытым моры і на базах, падтрымліваць сухапутныя войскі высадкай марскіх дэсантаў, агнём з караблёў, ударамі авіяцыі, зрываць варожыя марскія перавозкі і абараняць свае марскія зносіны.

Літ.: Боевой путь Советского Военно-Морского Флота, [2 выд.], М., 1967; Яковлев В. Д. Советский Военно-Морской Флот, 2 изд., М., 1969.

М. П. Уюненка. Масква.

ВАЕННА-НАВУКОВЫЯ ТАВАРЫСТВЫ, добраахвотныя арганізацыі ва Узброеных Сілах СССР. Аб'ядноўваюць генералаў, адміралаў і афіцэраў. Асн. задачы: вывучэнне і распрацоўка ваен. тэорыі, ваен. тэхнікі і баявога вопыту войнаў; распрацоўка сучасных спосабаў вядзення бою (аперацыі),

вых метадаў абучэння і выхавання войск; прапаганда ваен.-навук. і ваен.-тэхн. ведаў.

Першае В.-н. т. арганізавана ў кастр. 1920 пры Ваенным акадэміі Рабоча-Сялянскай Чырв. Арміі. Пазней яно перайменавана ў Т-ва садзеяння абароне СССР, у 1927 злілося з Авіяхімам, утварыўшы Асаавіяхім. З 1956 В.-н. т. створаны пры вайсковых часцях, ваенна-навуч. установах, штабах, дамах афіцэраў.

Пры Мінскім акруговым доме афіцэраў В.-н. т. (з 1957) маё 4 секцыі: парт.-паліт. работы, аператыўна-тактычную, ваенна-гістарычную, ваенна-тэхнічную.

ВАЕННА-ПАВЕТРАНЫЯ СІЛЫ (ВПС), від узброеных сіл дзяржавы; афіцыйная назва ваеннай авіяцыі ў СССР, ЗША і інш. краінах. ВПС прызначаны для сумесных баявых дзеянняў з інш. відамі ўзбр. сіл і для самастойнага выканання аператыўна-стратэгічных задач. У залежнасці ад прызначэння падзяляюцца на авіяцыю далёкалётную, франтавую, ваенна-транспартную; у залежнасці ад характару задач, лётна-тактычных дадзеных і ўзбраення самалётаў — на *знішчальную авіяцыю, знішчальна-бамбардзіровачную авіяцыю, бамбардзіровачную авіяцыю, разведвальную авіяцыю* і *дапаможную авіяцыю* (санітарную, сувязі). Задачы ВПС: барацьба за панаванне ў паветры, садзейнічанне сваім войскам і флоту, нанясенне магутных удараў па аб'ектах глыбокага тылу праціўніка, перавозка войск і грузаў, высадка паветр. дэсанта, паветр. разведка. ВПС маюць высокую манеўранасць, могуць знаходзіць і знішчаць важныя малапамерныя і рухомыя аб'екты, весці назіранні за дзеяннямі праціўніка і перадаваць з борта самалёта звесткі на пункты кіравання.

Ваен. авіяцыя ў розных краінах з'явілася ў 1910; у баях яна ўпершыню ўдзельнічала ў 1911—12 у Трыпалітанскай вайне (Італіі з Турцыяй). Авіяц. атрад рус. самалётаў першы раз удзельнічаў у баях у 1913 у час Балканскай вайны. Да пач. 1-й сусв. вайны ВПС Расіі, Францыі, Англіі, Германіі, Аўстра-Венгрыі, Італіі мелі разам 806 ваен. самалётаў.

Сав. ВПС створаны ў 1918 па ініцыятыве У. І. Леніна. У Айч. вайну цесна ўзаемадзейнічалі з сухап. войскамі і ВМФ, істотна іх падтрымлівалі, наносілі ўдары па ваен.-стратэгічных аб'ектах праціўніка ў глыбокім тыле. Толькі ў *Беларускай аперацыі 1944* удзельнічалі 4 паветр. арміі (1-я, 3-я, 4-я, 16-я), якія мелі 5 тыс. самалётаў. Пасля вайны адбылося пераўзбраенне сав. ВПС рэактыўнымі самалётамі, ядзернай зброяй, авіяц. ракетамі «паветра — зямля» («паветра — карабель») і «паветра — паветра», ідзе ўдасканальванне авіяц. тэхнікі. Ваенна-транспартная авіяцыя мае магчымасць перапраўляць у глыбокі тыл праціўніка злучэнні паветрадэсантных войск разам з танкамі, гарматамі, інш. баявой тэхнікай. Гл. таксама *Авіяцыя.*

Літ.: Военно-воздушные силы, М., 1959.

А. Н. Разанаў, М. М. Кажэўнікаў. Масква.

ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ, працэс фарміравання ў савецкіх грамадзян гатоўнасці і ўмення ў любы момант мужна абараняць Айчыну, выхаванне любві і адданасці Радзіме, састаўная частка камуніст. выхавання.

Ажыццяўляецца ў школе і ў сістэме ўсёй масава-выхаваўчай работы сярод працоўных. Уключае азнаямленне з ваен. гераічнай мінулага, з баявымі подзвігамі сав. народа ў Кастр. рэвалюцыю, грамада. і Айч. войны. Асаблівую ролю ў В.-п. в. адыгрывае ўшанаванне памяці тых, хто загінуў у баях. Каб прывіць сав. людзям ваен. ўменне і навыкі, арг-цыі *ДТСААФ СССР* ствараюць гурткі па вывучэнні ваен. тэхнікі, наладжваюць ваенна-спарт. спаборніцтвы, ваенізаваныя паходы, вучэнні па праграме грамада. абароны і інш.

У В.-п. в. насельніцтва Беларусі шырока выкарыстоўваюцца матэрыялы *Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Брэсцкай крэпасці-героя музея,* мемарыяльнага комплексу Хатынь (Мінская вобл.), музея камсамольскай славы ў пас. Обаль Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. і інш. Вялікую работу ў В.-п. в. моладзі і школьнікаў вядзе камсамол Беларусі. У рэспубліцы з 1965 да 1969 ва Усесаюзным паходзе камсамольцаў і моладзі па мясцінах рэвалюц., баявой і прац. славы сав. народа прынялі ўдзел каля 7 млн. чал. У атрадах юных сяброў Сав. Арміі і юных сяброў пагранічнікаў больш за 15 тыс. дзяцей (1969). У 1969 здалі нормы на значкі «Гатоў да працы і абароны» і «Гатоў да абароны Радзімы» каля 300 тыс. чал. Пры РК ЛКСМБ і раённых ваен. камісарыятах працуюць лекторыі будучага воіна. Камсамол Беларусі шэфствуе над *Балтыйскім флотам* (з 1923) і над групай сав. войск у ГДР.

І. Ф. Харламаў. Гомель;
А. С. Шурмялёў. Мінск.

ВАЕННА-ПРАМЫСЛОВЫЯ КАМІТЭТЫ (ВПК), арганізацыі буржуазіі ў Расіі, створаныя ў 1915, у 1-ю сусв. вайну.

Мелі на мэце мабілізацыю прамысловасці на патрэбы вайны, атрыманне ад царскага ўрада выгадных ваен. заказаў і паліт. уступак, раскол рэвалюц. руху і падпарадкаванне рабочага класа ўплыву буржуазіі. На пач. 1916 створаны Цэнтр. ВПК на чале з А. І. Гучковым і А. І. Канавалавым і 220 мясцовых, аб'яднаных у 33 абласныя. Спроба буржуазіі залучыць праз ВПК на свой бок рабочыя масы не мела поспеху. У выніку агітац. дзейнасці бальшавікоў «рабочыя групы» створаны толькі ў 36 ВПК, ці ў 15% іх агульнай колькасці. У лют.— кастр. 1917 ВПК былі цэнтрамі контррэвалюц. сіл. Пасля Кастр. рэвалюцыі пастаўлены пад кантроль ВСНГ, з 31.3.1918 перайменаваны ў Народнапрамысл. к-ты. У ліп. 1918 за варожую дзейнасць супраць Сав. улады ліквідаваны.

На Беларусі да акупацыі яе тэр. ням. войскамі існавала 8 ВПК (Бабруйскі, Віцебскі, Гомельскі, Гродзенскі, Магілёўскі, Мінскі, Пінскі, Слонімскі). 19.7.1915 на з'ездзе ў Вільні сфарміраваны Паўн.-Зах. ВПК, які пашыраў сваю дзейнасць на Зах. і часткова Паўн. фронты.

ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРЫ АБЛАСНЫМ САЮЗЕ РСДРП ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ, створана бальшавікамі для рэвалюц. работы ў войску. З пач. 1906 існавала пры *Паўночна-Заходнім саюзе РСДРП,* а пасля яго рэарганізацыі (май — чэрв. 1906) — пры *Абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі.* Узначальваў прадстаўнік к-та Абл. саюза Сакалоўскі (парт. псеўд. Тамаш). Аб'ядноўвала і накіроўвала дзейнасць *Бабруйскай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП, Брэсцкай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП, Віцебскай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП, Гродзенскай*

ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП, Ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі пры Мінскай групе РСДРП, с.-д. арг-цый салдатаў у Лідзе, Бярозе-Картузскай, Слоніме. Была звязана з Цэнтр. Варшаўскай ваен.-рэвалюц. арг-цыяй РСДРП. Распаўсюджвала бальшавіцкую л-ру, газеты: «Казарма» — орган Ваеннай арг-цыі РСДРП, *«Солдатская жизнь»* — ваенна-рэвалюц. орган к-та Абл. саюза РСДРП Літвы і Беларусі. Выпускала лістоўкі, адозвы, звароты да салдатаў, у якіх прапагандавала ленінскія ідэі пра ўзбр. паўстанне, сумесную барацьбу рабочых, салдатаў і сялян супраць царскага самадзяржаўя. У 1906 на Беларусі адбыліся салдацкія выступленні: у крэпасці Асавец гродзенскага ўмацаванага раёна, у Брэсцкім гарнізоне (гл. *Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906*), Пяцігорскага палка ў мяст. Картуз-Бяроза, запасных Магілёўскай губ. Разгромлена пасля паражэння рэвалюцыі 1905—07.

Літ.: Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955. *М. Я. Шкляр.* Мінск.

ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРЫ МІНСКАЙ ГРУПЕ РСДРП. Узнікла ў пач. 1905. Пасля ўтварэння *Ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі пры Абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі* дзейнічала пад яе кіраўніцтвам. Вяла паліт. работу сярод салдатаў Мінскага і Навагрудскага гарнізонаў, чыг. брыгады ў Баранавічах, у часцях, якія рыхтаваліся да адпраўкі на рус.-японскую вайну, і сярод запасных. Выдавала лістоўкі. У ліп. 1905 пад уплывам агітацыі чл. ваенна-рэвалюц. арг-цыі на ст. Мінск узбунтаваліся салдаты чыг. батальёна, які ехаў на Д. Усход. Газ. «Пролетарій» паведамляла, што салдаты добра праінфармаваны пра рэвалюц. падзеі, «спачувальна адносяцца да «Пацёмкіна», варожа — да вайны, на якую іх вязуць, і асабліва да ўрада». У ліст. 1905 ваенна-рэвалюц. арг-цыя паладзіла мітынг навабранцаў, якія ў рэзалюцыі заявілі, што прысяга на вернасць айчыне абавязвае іх разам з пралетарыятам змагацца супраць самадзяржаўна-памешчыцкага ладу. Паліт. агітацыя садзейнічала *Баранавіцкаму выступленню рабочых і салдат 1905*. Ваенна-рэвалюц. арг-цыя пры Мінскай групе РСДРП дзейнічала да 1907.

Літ.: Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955. *М. Я. Шкляр.* Мінск.

ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНЫ КАМІТЭТ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ, часовы рэвалюц. орган па правядзенні ўзброенага паўстання і ўстанаўленні Савецкай улады на тэр. Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губ. і Заходняга фронту.

Створаны па ініцыятыве Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэп. 27.10(9.11).1917 у складзе прэзідыума Мінскага Савета, бюро Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў Заходняй вобласці, ту, прадстаўнікоў Мінскага чыг. к-та і вайск. часцей Мінска, якія перайшлі на бок бальшавікоў. Пазней ВРК павялічыўся за лік прадстаўнікоў усіх Саветаў рабочых і салдацкіх дэп. Беларусі і вайск. часцей Зах. фронту (па 1 прадстаўніку ад кожнага Савета і кожнай дывізіі і корпуса). Аддзелы: грамадзянскі, ваенны, гаспадарчы, забеспячэння, арганізацыйны і сувязі, мандатны, інфармацыйны. Прадстаўнікі аддзелаў складалі бюро, старшынёй якога выбраны К. І. *Ландар*, чл. А. Ф. *Мяснікоў*, М. У. Рагазінскі, М. І. Калмановіч, М. І. Крывашэін, У. С. Селязнёў, В. М. Фрэйман.

ВРК накіраваў на дапамогу Мінскаму Савету браняпоезд, браневікі, рэвалюц. 60-ы Сібірскі полк; назначыў сваіх прадстаўнікоў ва ўсе грамадз. і ваен. ўстановы; 4(17).11. 1917 распусціў эсэра-меншавіцкі «Камітэт ратавання рэвалюцыі»; арыштаваў ваен. камісара Часовага ўрада на Зах. фронце; змясціў галоўнакамандуючага Зах. фронту П. С. Балуева, які адмовіўся падпарадкавацца Сав. уладзе, і назначыў на яго месца чл. ВРК В. В. *Каменшчыкава*; удзельнічаў у ліквідацыі контррэвалюц. Стаўкі ў Магілёве, блакіраваў яе сваімі войскамі з Пд у раёне Жлобіна; паставіў пад кантроль сваіх камісараў работу чыг. станцый; накіраваў у штаб ням. Усх. фронту дэлегацыю, якая ў мяст. Солы 21.11(4.12).1917 падпісала дагавор пра перамір'е на Зах. фронце; праводзіў работу па ажыццяўленні перших дэкрэтаў Сав. улады, дэмакратызацыі арміі, падрыхтоўцы і скліканні з'езду Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Зах. вобласці, 2-га з'езду арміі Зах. фронту, 3-га з'езду сялянскіх дэп. Мінскай і Віленскай губ., якія выбралі органы Сав. улады. Спыніў сваю дзейнасць 26.11(9.12).1917 пасля стварэння *Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці* і *фронту* (Аблвыкамзаха) і *Абласнога Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту*.

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 2, Мн., 1957; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967. *М. І. Камінскі.* Мінск.

ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ КАМІТЭТЫ (ВРК), баявыя органы рабочых, салдатаў і сялян Расіі, створаныя бальшавікамі для падрыхтоўкі і ажыццяўлення ўзброенага паўстання, устанаўлення і ўмацавання Сав. улады. Першы ВРК створаны ў сярэдзіне кастр. 1917 у Петраградзе, працаваў пад кіраўніцтвам ЦК РСДРП(б) і асабіста У. І. Леніна і стаў штабам паўстання і цэнтр. органам дзярж. улады, якую перадаў II Усерасійскаму з'езду Саветаў. У кастр.— снеж. 1917 ВРК арганізаваны ўсюды ў краіне і адыгралі вял. ролю ў барацьбе за перамогу Кастр. рэвалюцыі і ўмацаванне Сав. улады на месцах. На Беларусі ВРК узніклі ў канцы кастр.— ліст. 1917: 27 кстр. (9 ліст.) у Мінску (гл. *Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту*) і Віцебску, 29 кастр. (11 ліст.) у Нясвіжы, 8(21) ліст. ў Вілейцы і Гарадку, 18 ліст. (1 снеж.) у Магілёве і г. д., а таксама ва ўсіх арміях, дывізіях і інш. вайсковых падраздзяленнях Зах. фронту. З умацаваннем завоеў рэвалюцыі і стварэннем органаў Сав. улады неабходнасць у ВРК адпала, іх функцыі пераходзілі да Саветаў. У час грамадз. вайны і замежнай ваен. інтэрвенцыі 1918—20 у БССР, як і ў інш. раёнах краіны, ствараліся часовыя надзвычайныя органы Сав. улады — *рэвалюцыйныя камітэты* (рэўкомы).

Літ.: Гл. пры арт. *Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.*

ВАЕННА-ТАПАГРАФІЧНАЯ СЛУЖБА, спецыяльная служба, якая забяспечвае ўзброеныя сілы і дзяржаву картамі і геадэзічнымі звесткамі. В.-т. с. мае свае органы ў штабах злучэнняў і аператыўных аб'яднанняў, тапаграфічныя, аэрафотатапаграфічныя, тапагеадэзічныя атрады, ваен. навуч. ўстановы, картаграфічныя фабрыкі і інш. У мірны час займаецца стварэннем тапаграф. картаў і падрыхтоўкай геад. звестак на тэр. магчымых тэатраў ваен. дзеянняў, тапаграф. падрыхтоўкай войск, н.-д. работай у галіне аэрафотаздымкі, фотаграмметрыі, геадэзіі і картаграфіі. У ваенны час гал. задача В.-т. с.— тапагеадэзічнае забеспячэнне баявых дзеянняў войск.

ВАЕННА-ТРАНСПАРТНАЯ АВІЯЦЫЯ, від авіяцыі ВПС; прызначана для дэсантавання, перавозкі войск, баявой тэхнікі і грузаў забеспячэння, эвакуацыі раненых і хворых. Мае на ўзбраенні ваенна-транспартныя самалёты вял. грузападымальнасці і далёкасці палёту, верталёты, дэсантныя планёры.

ВАЕННА-ЭКАНАМІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ, рэальныя магчымасці дзяржавы забяспечыць матэрыяльныя патрэбы сучаснай вайны. Вызначаецца станам прадукц. сіл, аб'ёмам і структурай вытворчасці ў краіне, яе паліт. ладам, развіццём транспарту, ступенню распрацоўкі прыродных багаццяў і іх запасамі, колькасным і якасным складам насельніцтва і інш. Пры ацэнцы В.-э. п. краіны ўлічваюцца характар і маштабы вайны, памеры яе патрэб, стан узбр. сіл і стан тылу.

ВАЕННАЯ АДУКАЦЫЯ, працэс і вынік набыцця сістэматызаваных ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных ваеннаслужачым для практычнай дзейнасці. В. а. ажыццяўляюць *ваенныя навучальныя ўстановы*. Станаўленне В. а. як самастойнай галіны спец. адукацыі пачалося з канца 17 — пач. 18 ст., калі ў краінах Еўропы з'яўляюцца спецыялізаваныя ваенна-навуч. ўстановы. Развіццё В. а. цесна звязана з развіццём ваеннай навукі і ваеннага майстэрства. У СССР створана сістэма ваенна-навуч. устаноў, у якіх ваеннаслужачыя набываюць ваен., паліт., інж.-тэхн., спец. веды і неабходныя навыкі па ўсіх галінах ваен. навукі. В. а. мае тры ступені: вышэйшую, сярэднюю, пачатковую.

Вышэйшую ваен. (ваенна-спец.) адукацыю даюць ваен. акадэміі, вышэйшыя ваен. вучылішчы і ваен. ф-ты пры грамадз. ВНУ. Тэрмін навучання 3—5 гадоў. Адрозніваюць: вышэйшую В. а. агульнакамандную, ваенна-паліт., ваенна-інж., ваенна-спец. (мед., фінансавую, юрыдычную, муз., фізкультурную і інш.). Навучанне дзённае, па многіх спецыяльнасцях і завочнае. Сярэднюю В. а. даюць 3-гадовыя ваен. вуч., якія рыхтуюць камандзіраў, тэхнікаў і інш. ваен. спецыялістаў. Пачатковая В. а., ці т. зв. адукацыя ваеннаслужачых радавога (сяржанцкага) саставу, прадугледжвае атрыманне паліт., ваен. і спец. ведаў, практычных навыкаў як самастойна, так і ў саставе разліку, экіпажа, аддзялення і інш. Абавязковым з'яўляецца вывучэнне статутаў Узбр. Сіл СССР, матэрыяльнай часткі зброі, тэхнікі і спосабаў іх выкарыстання ў баі. Пачатковая В. а. складаецца: з пач. ваен. падрыхтоўкі юнакоў да службы ва ўзбр. сілах, якая праводзіцца ў адпаведнасці з законам Вярхоўнага Савета СССР ад 12.10.1967 «Аб усеагульным воінскім абавязку», і з навучання воінаў у час абавязковай воінскай службы.

У. М. Канаплянік. Масква.

ВАЕННАЯ АКРУГА, у СССР вышэйшае вайсковае адм.-тэр. аб'яднанне часцей, злучэнняў, ваенна-навучальных устаноў, ваенных устаноў розных родаў войск, а таксама ваенкаматаў, якія дыслацыруюцца на пэўнай тэр. і вырашаюць пытанні падрыхтоўкі краіны да абароны. У Расіі В. а. існавалі з 1862, у СССР з 31.3.1918. Узначальвае В. а. камандуючы войск акругі. Гл. таксама *Беларуская ваенная акруга*.

«ВАЕННАЯ АПАЗІЦЫЯ», група дэлегатаў VIII з'езду РКП(б) (1919), якая выступіла супраць тэзісаў ЦК партыі па ваенным пытанні. Гл. *Восьмы з'езд РКП(б)*.

ВАЕННАЯ ГЕАГРАФІЯ, гл. *Геаграфія ваенная*.

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ, галіна ваенных ведаў, якая абагульняе вопыт войнаў. Уключае: гісторыю войнаў (іх паліт. мэты і характар, прычыны ўзнікнення, перамог і паражэнняў, сілы, планы, страты, ход падзей, эканам. і ваен. вынікі); гісторыю ваен. майстэрства (спосабы і формы ўзбр. барацьбы на розных гістар. этапах, заканамернасці і ўзаемасувязь ваен. падзей з эканомікай, палітыкай і грамадскім ладам дзяржавы, гістар. вопыт і яго ўплыў на вядзенне войнаў у сучасных умовах); гісторыю відаў узбр. сіл і родаў войск (узнікненне і развіццё ўзбр. сіл, баявой тэхнікі, сродкаў і спосабаў выкарыстання відаў узбраення). Дапаможныя дысцыпліны: ваенная гістарыяграфія, крыніцазнаўства, археаграфія. В. г. раскрывае таксама суб'ектыўныя фактары; ролю палкаводцаў, здольнасці камандзіраў у арганізацыі баявых дзеянняў і маральнага духу войск. Вывучэнне В. г. ўзбройвае ваен. навуку абгрунтаванымі вывадамі пра перспектывы развіцця ваен. справы.

Літ.: Ленин В. И. О войне, армии и военной науке, т. 1—2, М., 1957; Марксизм-ленинизм о войне и армии, 5 изд., М., 1968; Методологические проблемы военной теории и практики, 2 изд., М., 1969; Мильштейн М. А. и Слободенко А. К. О буржуазной военной науке, М., 1957.

ВАЕННАЯ ДАКТРЫНА, афіцыйна прынятая ў дзяржаве сістэма навукова абгрунтаваных поглядаў і палажэнняў на характар сучасных войнаў, спосабы іх вядзення, якія вызначаюць формы будаўніцтва ўзбр. сіл і іх выкарыстанне ў вайне, а таксама метады падрыхтоўкі ўзбр. сіл і краіны да вайны. Асн. палажэнні В. д. вызначаюцца паліт. кіраўніцтвам дзяржавы і залежаць ад яе грамадскага ладу, расстаноўкі паліт. сіл на міжнар. арэне, эканам., маральна-палітычных і ваен. магчымасцей сваёй дзяржавы, верагоднага праціўніка і яго поглядаў на вядзенне вайны, геагр. становішча дзяржавы і суседніх з ёю дзяржаў, узаемаадносін з імі. В. д. мае паліт. і ваенна-тэхн. асновы. Паліт. асновы сав. В. д. грунтуюцца на марксісцка-ленінскім вучэнні пра вайну і армію, на ленінскіх прынцыпах знешняй палітыкі, адпавядаюць мірным імкненням сав. народа, інтарэсам абароны СССР і краін сацыялісц.

лагера. Сав. В. д. кіруецца палажэннямі пра мірнае суіснаванне дзяржаў з розным грамадскім і дзярж. ладам, пра адсутнасць фатальнай непазбежнасці вайны, вызначае будучую вайну як вырашальную сутычку дзвюх процілеглых сусв. сістэм — сацыялізма і капіталізму, выкрывае агрэс. сутнасць імперыялізму як адзіную крыніцу войнаў у сучасную эпоху.

Зместам ваенна-тэхн. боку В. д. з'яўляецца вызначэнне характару будучай вайны па сродках узбр. барацьбы, спосабаў яе вядзення і, выходзячы з гэтага, арганіз. прынцыпаў буд-ва арміі, яе тэхн. аснашчэння і ўсебаковай падрыхтоўкі ўзбр. сіл і краіны да вайны. Будучая сусв. вайна па сродках узбр. барацьбы можа быць ядзерная. Вырашальная роля ў такой вайне будзе належаць ракетна-ядзернай зброі. Разам з тым сав. В. д. лічыць, што канчатковая перамога над праціўнікам будзе дасягнута толькі аб'яднанымі намаганнямі ўсіх відаў узбр. сіл. Паколькі ядзерная вайна будзе знішчальная, нельга выключаць магчымасці сусв. вайны з абмежаваным выкарыстаннем ядз. зброі. *Лакальныя войны* (т. зв. абмежаваныя), якія развязваюць правячыя колы імперыялістычных краін, могуць весціся звычайнымі сродкамі паражэння. У сучасных умовах ёсць пагроза перарастання лакальных войнаў у сусветную ракетна-ядзерную вайну.

Сутнасцю В. д. ЗША пасля 2-й сусв. вайны з'яўляецца падрыхтоўка раптоўнага нападу на Сав. Саюз і краіны сацыялізма. лагера, дасягненне сусв. панавання з дапамогай сродкаў масавага паражэння. Паліт. і ваен. дзеячы ЗША імкнуцца ўтаіць сапраўдныя мэты агрэс. вайны, якую яны рыхтуюць. Афіцыйнай В. д. ЗША, а з 1967 і НАТО стала «стратэгія гібкага рэагавання», якая прадугледжвае такое развіццё узбр. сіл, пры якім яны маглі б весці ўсеагульную сусв. ядзерную вайну і абмежаваныя войны, выкарыстоўваць ядзерную зброю і звычайныя сродкі паражэння. В. д. ФРГ — «стратэгія перадавой абароны», або «стратэгія перадавых рубяжоў». Яна ўваходзіць у афіц. дакументы НАТО. Прадугледжвае пачатак баявых дзеянняў на ўсх. рубяжах ФРГ з неадкладным пераносам вайны на тэрыторыі сацыялістычных дзяржаў.

Асн. палажэнні сав. В. д. вызначаны ў Праграме КПСС і атрымалі развіццё ў рашэннях XXIII з'езду партыі. Гал. задачай нашых узбр. сіл сав. В. д. лічыць забеспячэнне іх пастаяннай гатоўнасці адбіць нечаканы напад агрэсара.

Літ.: Ломов Н. А. Советская военная доктрина, М., 1963; Малиновский Р. Я. Бдительно стоять на страже мира, М., 1962; Трофименко Г. А. Стратегия глобальной войны, М., 1968.

У. П. Шутай. Мінск.

ВАЕННАЯ ДЭМАКРАТЫЯ, форма грамадскай улады ў эпоху разлажэння першабытнаабшчыннага ладу і пераварэння яго ў класавае грамадства. Тэрмін увёў Л. Г. Морган. Ім карыстаюцца і для абазначэння эпохі распаду першабытнага грамадства. Пры В. д. ўзмацнялася асабістая ўлада правадыра або военачальніка дружыны, якая паступова ператваралася ў прывілеяваную групу пры наяўнасці першабытнай дэмакратыі. Грабежніцкія войны ўзбагачалі і ўзмацнялі дружыну. Прыклады В. д.: антычная Грэцыя эпохі Гамера, Ст. Рым у т. зв. царскі перыяд, грамадства скіфаў, кельтаў, стараж. германцаў, нарманаў і інш. Паводле археал. перыядызацыі В. д. адпавядаюць эпохі бронзы і раняга жалеза.

ВАЕННАЯ ІДЭАЛОГІЯ, мілітарысцкая ідэалогія агрэсіўных колаў імперыялістычных краін, для якіх войны — сродак насільнага перадзелу свету, фактар развіцця бурж. грамадства.

Паняцце «военная ідэалогія» ўжываецца пераважна ў дачыненні да агрэс. канцэпцый імперыялістычных колаў. В. і. з'яўляецца асновай *военной доктрины* імперыялістычных дзяржаў. Мае на мэце паліт. і псіхал. падрыхтоўку народа да вайны (апраўданне гонкі ўзбраенняў, злачынная палітыка распальвання новай сусв. вайны); ваенна-тэхн. падрыхтоўку дзяржавы да вядзення агрэс. імперыялістычных войнаў. Культывуе чалавеканенавісніцкія ідэі расізму, шавінізму, валюнічага антыкамунізму, каланіялізму, імкнецца апраўдаць сілу як аснову ўнутранай і знешняй палітыкі («палітыка з пазіцыі сілы», «палітыка на грані вайны» і інш.). В. і. разглядае вайну як вечную, непазбежную для чалавецтва з'яву, імкнецца затушаваць класавы характар войнаў, іх прычыны.

Агрэс. намеры імперыялістычных краін, перш-наперш ЗША, вымушаюць дзяржавы сацыялістычнага садружнасці пільна сачыць за інтрыгамі мілітарыстаў, няспынна ўмацоўваць сваю абаронную магутнасць.

Літ.: Марксизм-ленинизм о войне и армии, 5 изд., М., 1968.

А. М. Быхаў. Мінск.

ВАЕННАЯ МЕДЫЦЫНА, тэорыя і практыка аховы здароўя асабовага саставу ўзбр. сіл. Задачы В. м.: умацаванне здароўя асабовага саставу войск; папярэджанне і лячэнне хвароб і баявых пашкоджанняў; аднаўленне баяздольнасці і вяртанне ў строй максімальнай колькасці хворых і параненых.

Яшчэ ў 1654 у Маскве была адкрыта першая школа лекараў, якая рыхтавала кадры стралецкаму войску. У 1716 утрыманне мед. чыноў у арміі замацавана вайсковым статутам, былі заснаваны першыя шпіталі (1722), створана сістэма лячэння на месцы ваен. дзеянняў. Заснавальнік навук. В. м. М. І. Пірагоў распрацаваў вучэнне пра траўматычную эпідэмію і прынцыпы адзінства лячэння з арганізацыяй ваенна-мед. службы і размеркаваннем параненых на этапах эвакуацыі (1853—56). Вядомы рускі хірург У. А. Опель прапанаваў ідэю «этапнага лячэння параненых» (1917). Для развіцця В. м. шмат зрабілі М. Я. Мудроў; у 1-ю сусв. вайну — М. А. Вельяміноў, М. М. Валковіч, А. П. Крымаў, М. М. Пятроў; у Вял. Айч. вайну — М. Н. Бурдзенка, М. Н. Апухцін, С. С. Гіргалаў, М. М. Яланскі, П. А. Купрыянаў, У. М. Шамаў і інш.

У аснове сав. В. м. ляжыць сістэма этапнага лячэння з эвакуацыяй у залежнасці ад характару і цяжкасці ранення. Гэты прынцып аб'яднаў лячэбную і эвакуац. справу ў адзіны комплекс. У Вял. Айч. вайну ваенна-мед. служба Сав. Арміі вярнула ў строй 72,3% параненых і больш за 90% хворых. У сувязі з магчымасцю ўжывання зброі масавага паражэння (ядзернай, хімічнай, бактэрыялагічнай) роля В. м. павялічылася. У яе ўваходзяць навукі: арганізацыя і тактыка мед. службы, ваенна-палявая хірургія, ваенна-палявая тэрапія, ваен. гігіена (у т. л. ваенна-марская і авіяц.), ваен. эпідэміялогія, ваенна-ўрачэбная экспертыза, судовая экспертыза, ваенна-мед. статыстыка, ваенна-мед. ахова, гісторыя ваен. медыцыны, ваенна-мед. геаграфія, фізіялогія ваен. працы, патамарфалогія ваен. траўмы, ваен. таксікалогія, ваенна-мед. забеспячэнне і інш.

Літ.: Багдасарьян С. М. Краткий исторический очерк развития советской военной медицины, у кн.: Вопросы истории медицины. Труды ин-та организации здравоохранения и истории медицины им. Н. А. Семашко, в. 5, М., 1959; Кувшинский Д. Д. 50 лет советской военной медицине, «Военно-медицинский журнал», 1967, № 10; Очерки истории советской военной медицины, Л., 1968.

І. Ц. Перапяліца. Мінск.

ВАЕННАЯ НАВУКА, сістэма ведаў пра падрыхтоўку і вядзенне вайны дзяржавай, кааліцыяй дзяржаў або класамі для дасягнення паліт. мэт. Даследуе законы і прынцыпы развіцця ваен. справы, характар войнаў і спосабы іх вядзення, распрацоўвае пытанні тэорыі *ваеннага майстэрства*, буд-ва і падрыхтоўкі ўзбр. сіл да вайны. Найважн. састаўныя часткі савецкай В. н.— стратэгія, аператыўнае майстэрства і тактыка, якія складаюць тэорыю ваен. майстэрства. Галінамі В. н. з'яўляюцца таксама ваен. гісторыя (вывучае гісторыю войнаў, ваен. майстэрства, гісторыю буд-ва ўзбр. сіл, тэхн. аснашчэння відаў узбр. сіл і родаў войск і развіцця ваен.-тэарэт. поглядаў на прыроду і характар вайны і інш.); тэорыя *грамадзянскай абароны*; ваен. адміністрацыя (вывучае асновы арганізацыйнага буд-ва Узбр. Сіл СССР, іх камплектавання і інш.); ваенная геаграфія; тэорыя навучання і выхавання войск; ваенна-тэхн. навукі (распрацоўваюць віды ўзбраення, ваен. тэхнікі, матэрыяльныя сродкі для ўзбр. сіл і інш.).

В. н. мае класавы характар, яе вывады выкарыстоўваюцца пры вызначэнні *ваеннай дактрыны* дзяржавы. Развіваецца В. н. абагульненнем гістар. вопыту вядзення вайны і аналізу практ. дзейнасці войск у мірны час, а таксама на падставе прадбачання новых сродкаў узбр. барацьбы і магчымых форм і спосабаў яе вядзення. На яе развіццё непасрэдна ўплываюць дасягненні інш. грамадскіх, прыродазнаўчых і тэхн. навук. У кожнай дзяржаве В. н. мае свае рысы, абумоўленыя грамадска-паліт. ладам, станам эканомікі, геагр. размяшчэннем і нац. асаблівасцямі. Адкрыццё К. Марксам і Ф. Энгельсам законаў дыялект. і гістар. матэрыялізму зрабіла рэвалюц. пераварот у грамадскіх навуках, у т. л. і ў ваеннай. Упершыню была раскрыта залежнасць спосабаў вядзення вайны, арганізацыі арміі, яе ўзбраення, стратэгіі і тактыкі ад характару эканам. ладу грамадства і яго паліт. надбудовы. У. І. Ленін развіў найважн. пытанні марксісцкай ваен. тэорыі: пра рашаючую ролю нар. мас, эканам. і маральна-паліт. фактараў у сучаснай вайне, пра сувязь ваен. арг-цыі і ваен. майстэрства з грамадскім і дзярж. ладам, станам і развіццём ваен. тэхнікі, пра заканамернасці, спосабы і формы ваен. дзеянняў, адзінства паліт. і ваен. кіраўніцтва ў вайне; стварыў цэласнае вучэнне пра абарону сацыялістычных краін і вызначыў шляхі буд-ва Сав. Узбр. Сіл.

Сав. В. н. служыць інтарэсам сав. народа і народаў усіх краін сацыялістычнага садружнасці, інтарэсам захавання міру ва ўсім свеце. У гэтым яе істотнае адрозненне ад бурж. В. н., якая служыць рэакц. інтарэсам імперыялістычных краін і накіравана на падрыхтоўку і развязванне агрэс. войнаў.

Літ.: Азовцев Н. Н. Военные вопросы в трудах В. И. Ленина. Аннотированный указатель произведений и высказываний В. И. Ленина по важнейшим вопросам войны, армии и военной науки, М., 1964.

В. М. Кручынін. Масква.

ВАЕННАЯ ПРЫСЯГА, у СССР урачыстая клятва савецкіх грамадзян, якія ўступаюць у рады Узброеных Сіл, на вернасць савецкаму народу і сацыялістычнай Радзіме. З'явілася разам з нараджэннем Чырв. Арміі па ініцыятыве саміх воінаў і наз. ўрачыстым абяцаннем, чырвонай прысягай.

Упершыню дэкрэт пра ўрачыстую В. п. воінаў Чырв. Арміі зацверджаны ВЦВК 22.4.1918. Прысягу ад першых часцей Чырв. Арміі прымалі выдатныя дзеячы партыі і ўрада. У маі 1918 У. І. Ленін прыняў урачыстае абяцанне ад байцоў і камандзіраў 4-га Маск. палка, Варшаўскага рэвалюц. палка і асобай зводнай вартавой дружыны. У сак. 1922 ВЦВК пастанавіў аб правядзенні да прысягі ўсіх воінаў Чырв. Арміі і Чырв. Флоту вызначыў дзень і парадак прынцяцця прысягі (калектыўна, у страі, у дзень першамайскага парада). У 1939 зацверджаны новы тэкст і новае палажэнне аб прынцяцці В. п. (індывідуальна, перад строем сваіх таварышаў, прынцяцце прысягі замацоўваецца ўласным подпісам). Сучасны тэкст прысягі зацверджаны Вярх. Саветам СССР 10.6.1947. Прысяга прымаецца і ў арміях капіталіст. дзяржаў. Звычайна суправаджаецца элементамі рэліг. рытуалу. Фразамі пра вернасць богу і айчыне імперыялісты прыкрываюць свае агрэс. захопніцкія мэты, сапраўднае прызначэнне бурж. арміі.

ВАЕННАЯ ТАПАГРАФІЯ, гл. *Тапаграфія ваенная.*

ВАЕННЫ ДРУК, перыядычныя і неперыядычныя выданні, якія асвятляюць пераважна ваенныя і ваенна-палітычныя пытанні; у СССР — сродак камуніст. выхавання асабовага саставу Узбр. сіл.

Першая рус. газета «Ведомости» («Ведомости о военных и иных делах...», з 1728 «Санкт-Петербургские ведомости»), засн. ў 1702 Пятром I; шмат увагі аддавала ваен. справе. Бальшавіцкі В. д. зарадзіўся ў рэвалюцыю 1905—07, калі выдавалася каля 15 салдацкіх газет, пераважна нелегальных («Казарма», орган Пецярбургскай ваен. арг-цыі; «Солдатская жизнь», орган Маскоўскай ваен. арг-цыі; *«Солдатская воля»*, орган Гродзенскай с.-д. ваен. арг-цыі; *«Солдатская жизнь»*, орган ваен.-рэвалюц. арг-цый Паўн.-Зах. саюза РСДРП; і інш.). У 1917 бальшавіцкі В. д., нягледзячы на праследаванні Часовага ўрада, вельмі пашырыўся: выходзілі газ. «Окопная правда», «Солдатская правда», «Знамя борьбы» і інш. Пасля Кастр. рэвалюцыі (1917—20) выдаваліся цэнтр. ваен. газ. «Рабочая и крестьянская Красная Армия и Флот», «Вооруженный народ» (выданне ваен. секцыі Петраградскага Савета), «Красная Армия» (выданне Петраградскай працоўнай камуны), «Московская газета Красной Армии» (выданне Рэвалюц. штаба Маскоўскай ваен. акругі). Выходзілі таксама франтавыя, армейскія, флоцкія і дывізійныя газеты. Войскі Зах. фронту абслугоўваліся армейскімі газ. *«Бюллетень Военно-революционного комитета X Армии»*, «Бюллетень Военно-революционного комитета II Армии», «Известия Военно-революционного комитета III Армии», «Воин революции» (орган паліт. ўпраўлення Зах. фронту, паліт. ўпраўлення Зах. Арміі і Зах. ваен. акругі, 1920, Смаленск), *«Красноармеец»* (орган палітаддзела Рэўваенсавета 16-й арміі) і інш. У 1920 у раёнах БССР, акупаваных бурж. польшчай, выходзіла падпольная газета, орган партыі-камуністаў Беларусі *«Белорусская правда»*. З 1921 выдавалася 16 цэнтр ваен. часопісаў і больш за 100 газет і часопісаў у ваен. акругах. З 22.6.1921 выходзіла «Красноармейская правда», газ. паліт. ўпраўлення Рэўваенсавета Зах. фронту (гл. *«Во славу Родины»*). З 1924 выдаецца газ. *«Красная звезда»* (орган Мін-ва абароны СССР). У 1938—60 выходзіла газ. Ваенна-Марскіх Сіл СССР «Советский флот» (да 1953 укл. пад назвай «Красный флот»). З 1919 выходзіць агульнапаліт. і літ.-мастацкі час. Галоўнага паліт. ўпраўлення Сав. Арміі і ВМФ «Советский воин» (да мая 1947 назвы мяняліся: «Красноармеец», «Красноармеец и краснофлотец», «Красноармеец-краснофлотец»).

У Айч. вайну колькасць ваен. газет значна павялічылася. Выдавалася (1944) 821 франтавая, акруговая, флоцкая, флатыльская, армейская, карпусная і дывізійная газета тыражом 3195 тыс. экз.; выходзіла 9 ваен. часопісаў, многа ваен. л-ры. Ваен. газеты выходзілі на 64 мовах народаў СССР, сярод іх — бел. франтавыя газ. *«За Савецкую Беларусь»* і *«За свабодную Беларусь»*. На часова акупаванай тэр. быў пашыраны парт.

падпольны друк. На Беларусі выходзілі газ. *«Звязда»*, «Партызан Беларусі» (з лют. 1943, орган Мінскага абкома КП(б)Б), «Народный мститель» (з ліст. 1942, Барысаўскі р-н, орган міжраённага к-та ЛКСМБ), *«Голас партызана»* (з вер. 1942, орган Клічаўскага РК КП(б)Б), «Партызан Гомельшчыны» (з мая 1943, орган Журавіцкага РК КП(б)Б) і інш., усяго 162 газ. (гл. *Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі*). Пасля вайны франтавыя газ. рэарганізаваны ў акруговыя. Створаны газеты акруг ППА і груп войск, якія знаходзяцца за межамі Радзімы. У 1969 выходзіла больш за 20 акруговых і флоцкіх газет, а таксама газет груп войск і акруг ППА краіны: «На страже Родины» (Ленінградская ВА, з 1919), «Красный воин» (Маскоўская ВА, з 1921), «Во славу Родины» (Беларуская ВА), «Знамя победы» (Паўн. група войск, з 1942), «Советская Армия» (група Савецкіх войск у Германіі), «Страж Балтики» (Балтыйскі флот, з 1919) і інш. Выдаюцца часопісы: «Коммунист Вооруженных Сил» (з 1960), «Старшина-сержант» (з 1960), «Военный вестник» (з 1921, орган Мін-ва абароны СССР, аб'яднаў часопісы «Танкист», «Артиллерийский журнал», «Военный связист» и «Военно-инженерный журнал»), «Авиация и космонавтика» (з 1962, замест час. «Вестник воздушного флота», з 1918). Адноўлены «Военно-исторический журнал» (з 1959). Працуе Ваеннае выдавецтва Мін-ва абароны СССР (засн. ў 1919); штогод выпускае каля 300 назваў кніг, брашур, альбомаў, плакатаў і інш. ваен. выданняў. Гл. таксама *Бальшавіцкі друк*.

Літ.: Советская военная печать, М., 1960; Жучков С. И. Фронтовая печать в годы Великой Отечественной войны, М., 1968; Краўчанка І. Падпольны бальшавіцкі друк у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Мн., 1950; Дастанка М. Е. Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 — май 1945), Мн., 1970.

І. А. Каратко́ў.

ВАЕННЫ КАМУНІЗМ, эканамічная палітыка Сав. дзяржавы ў час грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—20.

Найважн. меры В. к.: нацыяналізацыя, поруч з буйной, сярэдняй і дробнай прамысловасці; цэнтралізацыя кіраўніцтва і забеспячэння прамысловасці, нарыхтоўкі і размеркавання прадукцыі (сістэма глаўкізму); увядзенне *харчразвёрсткі* і ўсеагульнай прац. павіннасці; забарона прыватнага гандлю і тавараабароту; непасрэдны прадуктаабмен паміж гарадам і вёскай шляхам дзярж. размеркавання харч. прадуктаў і вырабаў прамысловасці паводле класавых прынцыпаў. Рабочыя і служачыя замест зарплаты атрымлівалі харчовы паёк (па. картках), бясплатна карысталіся кватэрамі, камунальнымі паслугамі, транспартам і інш. Палітыка В. к. ажыццяўлялася ў інтарэсах абароназдольнасці краіны і выклікана выключна цяжкімі ўмовамі вайны, гасп. разрухі, ваен. супраціўлення капіталіст. элементаў буд-ву сацыялізма. В. к. быў часовай, вымушанай мерай і не з'яўляецца абавязковым этапам сацыяліст. рэвалюцыі ў іншых краінах. Ён адыграў вялікую ролю ў забеспячэнні перамогі над унутранай і знешняй контррэвалюцыяй. Пасля грамадз. вайны X з'езд РКП(б) (1921) прыняў рашэнне пра пераход да *новай эканамічнай палітыкі* (нэп).

Літ.: Ленін У. І. Даклад аб замене развёрсткі натуральным падаткам 15 сакавіка [X з'езд РКП(б) 8—16 сакавіка 1921]. Аб харчовым падатку, Тв., т. 32 (Полн. собр. соч., т. 43); Яго ж. Да чацвёртай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Тв., т. 33 (Полн. собр. соч., т. 44); Гладков И. А. Очерки советской экономики 1917—1920 гг., М., 1956; Социалистические преобразования в экономике Белоруссии в 1917—1920 гг., Мн., 1966; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967, Мн., 1967.

М. Р. Матусевіч.

ВАЕННЫ САВЕ́Т, калегіяльны орган ва ўзброеных сілах. У СССР ствараюцца ў відах узбр. сіл, ваен. акругах, групах войск, акругах ППА, флотах, арміях і флатыліях. Складаюцца з старшыні (галоўнакамандуючы, камандуючы) і членаў. Склад В. с. Сав. Узбр. Сіл зацвярджаецца ЦК КПСС. В. с. вырашаюць найважн. пытанні жыцця і дзейнасці арміі і флоту і нясуць усю адказнасць за стан і баявую гатоўнасць войск.

Упершыню В. с. у Расіі створаны як часовы дарадчы орган пры імператары ў 1756. Склікаўся галоўнакамандуючым, каб абмеркаваць і прыняць асабліва важнае рашэнне (напр., савет у Філях, скліканы М. І. Кутузавым 1.9.1812). З 1832 пастаянны орган у складзе ваен. міністэрства. Пазней В. с. былі створаны і ў ваен. акругах. У дарэвалюц. Расіі В. с. ў асноўным — дарадчы органы. Першы В. с. у сістэме кіраўніцтва Сав. Узбр. Сіламі — Вышэйшы Ваенны Савет рэспублікі, засн. паводле пастановы СНК ад 4.3.1918. У гады грамадз. вайны В. с. ствараюцца пры франтах і ў арміях; з 1924 — у ваен. акругах. У час Айч. вайны В. с. франтоў і армій належала ўся вайсковая і адм. ўлада ў палосе дзеянняў войск адпаведнага аб'яднання.

ВАЕННЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ, навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць камандныя, тэхнічныя і спецыяльныя кадры сярэдняй кваліфікацыі для ўзброеных сіл. Гл. *Ваенныя навучальныя ўстановы*.

ВАЕННЫЯ ЗЛАЧЫНЦЫ, асобы, вінаватыя ва ўчыненні злачынстваў супраць міру і чалавецтва, супраць законаў і звычаяў вайны, прадугледжаных міжнар. правам. Статуты Нюрнбергскага (1945) і Такійскага (1946) Міжнар. ваенных трыбуналаў адносяць да В. з. асоб, вінаватых у планаванні, падрыхтоўцы, развязванні або вядзенні агрэс. вайны; у забойствах, катаваннях, вывазе ў рабства цывільнага насельніцтва акупаваных тэр.; у забойствах і катаваннях ваеннапалонных, забойствах заложнікаў; у аграбленні і бяссэнсавых разбурэннях гарадоў і вёсак і інш.

Упершыню пытанне пра пакаранне В. з. было практычна вырашана пасля перамогі над фашысцкімі агрэсарамі ў 2-й сусв. вайне. Як толькі былі створаны гал. органы ААН і першая сесія Ген. Асамблеі пачала сваю работу, дэлегацыя БССР прапанавала праект рэзалюцыі пра выдачу і пакаранне В. з. Прадстаўнікі Сав. Беларусі прывялі факты пра жудасныя злачынствы гітлераўскіх захопнікаў на бел. зямлі. У бел. праекце рэзалюцыі змяшчаліся спасылкі на найважн. міжнар.-прававыя акты, якія пацвярджаюць прынцып адказнасці В. з.,— Маскоўскую Дэкларацыю трох дзяржаў 1943, дэкларацыі саюзных урадаў 1942, рашэнні Гаагскай канвенцыі 1907 пра законы і звычаі вайны, Статут Міжнар. ваеннага трыбунала ад 8.8.1945. Ген. Асамблея ААН 13.2.1946 аднагалосна прыняла праект рэзалюцыі БССР. У сувязі з тым, што многія В. з. хаваюцца ад правасуддзя, Ген. Асамблея рэкамендавала ўсім членам ААН неадкладна арабіць захады, каб В. з. былі арыштаваны і высланы ў тыл краіны, дзе яны ўчынілі ваен. злачынствы, для суда і пакарання ў адпаведнасці з законамі гэтых краін. Ген. Асамблея заклікала ўрады дзяржаў, што не ўваходзяць у ААН, зрабіць тое самае.

Сав. Беларусь — адна з рэспублік, якая найб. пацярпела ад гітлераўскіх агрэсараў

(гл. *Акупацыйны рэжым*),— была зацікаўлена ў хутчэйшым і справядлівым пакаранні В. з. Многія В. з. былі справядліва пакараны за злачынствы, зробленыя ў час 2-й сусв. вайны (гл. *Нюрнбергскі працэс, Такійскі працэс*). Аднак некат. асобы, якія ўчынілі выключныя па сваёй жорсткасці злачынствы супраць мірнага насельніцтва, пазбеглі пакарання і адкрыта жывуць пад сваімі імёнамі ў ЗША, ФРГ, Канадзе і інш. капіталіст. краінах. Улады гэтых краін адмаўляюцца выдаць В. з. дзяржавам, на тэр. якіх былі ўчынены злачынствы. Дзякуючы намаганням прадстаўнікоў сацыяліст. дзяржаў 23-я сесія Ген. Асамблеі зацвердзіла 26.11.1968 Канвенцыю пра недастасаванне тэрміну даўнасці да ваен. злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва. Беларусь адна з першых падпісала яе (27.1.1969). Шырокая міжнар. падтрымка Канвенцыі служыць сур'ёзнай перасцярогай тым, хто пагражае міру і бяспецы народаў. У шэрагу краін прыняты законы, якія выключаюць ужыванне даўнасці да нацысцкіх В. з. Большасць В. з. 2-й сусв. вайны знаходзіцца ў Зах. Германіі. Аднак заходнегерманскія ўлады ўсяляк перашкаджаюць іх выкрыццю і справядліваму пакаранню. ФРГ, абвясціўшы скасаванне тэрміну даўнасці крымінальнага праследавання нацысцкіх В. з., адначасова заклікала захоўваць «міласэрнасць закону» да тых, хто дзейнічаў «па загадзе», «пад прымусам» і інш., хоць на гэтую вымушанасць, як паказалі судовыя працэсы над нацысцкімі В. з. ў мінулым, заўсёды беспадстаўна спасылаліся гестапаўскія каты і эсэсаўскія карнікі. Нават у тых выпадках, калі пад націскам грамадскай думкі ў Зах. Германіі праводзіцца адпаведны судовы разбор, амаль заўсёды асобы, якія ўчынілі найцяжэйшыя ваен. злачынствы, пазбягаюць пакарання ці засуджваюцца на нязначныя тэрміны турэмнага зняволення.

Літ.: СС в действии. Документы о преступлениях СС, пер. с нем., М., 1969; Краль В. Преступления против Европы, [пер. с чэш.], М., 1968. Гл. таксама літ. пры арт. *Акупацыйны рэжым*.

Ю. П. Броўка, М. А. Яфімаў.

ВАЕННЫЯ КАМІСАРЫ (ваенкомы), 1) прадстаўнікі *Ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў* у вайсковых часцях, чырвонагвардзейскіх атрадах, асобных раёнах і інш. у час падрыхтоўкі і правядзення Кастр. рэвалюцыі. 2) Прадстаўнікі Камуніст. партыі і Савецкага ўрада ва Узброеных Сілах СССР у перыяд (з перапынкамі) 1918—42. На пасады В. к. пасылаліся вопытныя работнікі: В. У. Куйбышаў, С. М. Кіраў, І. В. Сталін, Я. Ф. Фабрыцыус, Дз. А. Фурманаў, І. Я. Якір, П. П. Постышаў і інш. 3) Воінскае званне, якое існавала ў Чырв. Арміі ў 1935—42 (батальённы камісар, палкавы камісар і г. д.). В. к. разам з камандзірамі адказвалі за выкананне злучэннем, часцю ці падраздзяленнем баявой задачы, за іх баявую і паліт. падрыхтоўку, мат.-тэхн. забеспячэнне. Рост і ўдасканаленне камандных і паліт. кадраў Чырв. Арміі стварылі ўмовы для ліквідацыі інстытута В. к. і пераходу да поўнага *адзіначалля*. У кастр. 1942 устаноўлены інстытут намеснікаў камандзіраў па паліт. частцы. 4) Асобы, якія ўзначальваюць *ваенныя камісарыяты* рэспублікі, вобласці, раёна, горада.

ВАЕННЫЯ КАМІСАРЫЯТЫ, органы ваеннага кіравання ў рэспубліках, абласцях, гарадах, раёнах. Утвораны дэкрэтам СНК, падпісаным У. І. Леніным 8.4.1918. Вядуць улік ваеннаабавязаных і аўтатрактарнай тэхнікі, займаюцца ваенна-патрыятычным выхаваннем насельніцтва, пач. ваен. падрыхтоўкай юнакоў у сярэдніх навуч. установах, падрыхтоўкай і правядзеннем вайсковых мабілізацый, чарговых прызываў моладзі на дзейную ваен. службу, прызываў ваеннаабавязаных на вучэбныя і паверачныя зборы і інш.

ВАЕННЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНО́ВЫ, ваенныя акадэміі, ваенныя факультэты пры грамадзянскіх ВНУ, вышэйшыя і сярэднія ваенныя вучылішчы. Рыхтуюць камандныя, палітычныя, інжынерна-тэхнічныя і спец. кадры для ўсіх відаў узбр. сіл.

У Расіі першыя В. н. ў. (ваен. школы) з'явіліся ў канцы 17 — пач. 18 ст.: Ваен.-інж. школа (1698, Масква), Школа матэм. і навігацыйных навук (1701, Пецярбург). Вышэйшыя В. н. ў. ствараюцца з канца 18 ст.: у 1798 Медыка-хірургічная, у 1832 Ваен., у 1855 Артылерыйская, Інжынерная і інш. акадэміі (усе ў Пецярбурзе). Напярэдадні 1-й сусв. вайны ў Расіі было 20 ваен. вучылішчаў. Падрыхтоўка афіцэрскага саставу вялася таксама ў спец. класах Пажскага корпуса і ў 29 кадэцкіх карпусах, у т. л. ў Полацкім (з 1836).

У СССР сетка вышэйшых і сярэдніх В. н. у. (ваен. акадэмій, ваен. школ) і розных курсаў пачала ствацца ў перыяд грамадз. вайны і замежнай ваен. інтэрвенцыі. Першая адкрыта Акадэмія Ген. штаба Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў 1918 у Маскве (з 1925 Ваен. акадэмія імя Фрунзе) для падрыхтоўкі старшага і вышэйш. каманднага саставу. У Петраградзе адкрыліся ў 1918 Ваенна-медыцынская (з 1935 імя Кірава) і Ваенна-марская акадэміі. У 1925 створана Ваенна-палітычная акадэмія (з 1938 імя У. І. Леніна, у Маскве), а таксама Акадэмія ВПС РСЧА імя Жукоўскага, з якой у 1940 вылучылася Ваенна-паветр. акадэмія каманднага і штурманскага саставу ВПС (з 1968 Ваенна-паветр. акадэмія імя Гагарына, у Моніне). У 1932 засн. Ваен. акадэмія матарызацыі і механізацыі Чырв. Арміі (з 1967 Ваен. акадэмія бронетанкавых войск імя Маршала Сав. Саюза Маліноўскага, Масква), Ваенна-транспартная (да 1938 у Маскве, з 1956 Ваен. акадэмія тылу і транспарту ў Ленінградзе); акадэміі Ваенна-хімічная (з 1957 Ваен. акадэмія хім. засцярогі ў Маскве) і Ваенна-электратэхн. (з 1957 Ваен. акадэмія сувязі ў Ленінградзе); ствараюцца акадэміі Артылерыйская (падзелена пазней на дзве акадэміі: Ваенна-інж. імя Дзяржынскага ў Маскве і Ваен. артыл. імя Калініна ў Ленінградзе) і Ваен.-інж. (з 1935 акадэмія імя Куйбышава, Масква). У 1936 у Маскве засн. Ваен. акадэмія Ген. штаба Узбр. Сіл імя Варашылава, у 1941 Ленінградская ваенна-паветр. акадэмія (з 1955 імя Мажайскага, з 1963 Ваенная інж. акадэмія) і інш. Акрамя таго, падрыхтоўка ваен. кадраў з вышэйшай адукацыяй вялася на ваен. ф-тах пры грамадз. ВНУ.

Напярэдадні Айч. вайны падрыхтоўка ваен. кадраў з вышэйшай і сярэдняй ваен. і ваенна-спец. адукацыяй у СССР вялася па ўсіх спецыяльнасцях, неабходных для Сав. узбр. сіл. Імклівае развіццё ваен. навукі і тэхнікі ў пасляваенны перыяд, з'яўленне ракетна-ядз. зброі патрабавалі падрыхтоўкі ваен. кадраў высокай кваліфікацыі па шэ-

рагу новых спецыяльнасцей. Для гэтага арганізаваны Ваен. інж. радыётэхн. акадэмія ППА імя Маршала Сав. Саюза Говарава ў Харкаве (1946), Ваен. артыл. акадэмія імя Калініна ў Ленінградзе (1953), Ваен. камандная акадэмія ППА ў Калініне (1956). Змяніліся профілі падрыхтоўкі спецыялістаў у шэрагу ваен. акадэмій.

Вышэйшыя ваен. вучылішчы створаны пераважна на базе адпаведных сярэдніх ваен. вучылішчаў. Рыхтуюць афіцэраў з вышэйшай ваенна-спец. адукацыяй. Найстарэйшыя з іх — Маскоўскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вуч. імя Вярх. Савета РСФСР, Ленінградскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вуч. імя Кірава, Калінінградскае вышэйшае ваенна-інж. камандное вуч. імя Жданава, Тульскае вышэйшае артыл. камандное вуч. імя Тульскага пралетарыяту і інш. На Беларусі ў 1953 засн. Гомельскае вышэйшае ваен. інж. радыётэхн. вучылішча (з 1954 Мінскае вышэйшае інж. радыётэхн. вуч., з 1968 Мінскае вышэйшае інж. зенітна-ракетнае вуч. ПВА).

Ваен. вучылішчы (проціпаветр. абароны, авіяцыйна-тэхн., буд., тылавыя, фінансавыя і інш.) рыхтуюць камандныя, тэхн. і спец. кадры з сярэдняй ваен. і ваенна-спец. адукацыяй. У 1943 засн. суворaўскія, у 1944 нахімaўскія ваен. вучылішчы, якія даюць агульную сярэднюю адукацыю з павялічаным аб'ёмам ведаў па ваен. дысцыплінах. У 1953 адкрыта Мінскае суворaўскае ваен. вучылішча. Малодшы камандны састаў рыхтуецца ў вайсковых (флоцкіх) навуч. падраздзяленнях, часцях і злучэннях. Падрыхтоўка ваен. кадраў у краінах Варшaўскага дагавору праходзіць у ваен. акадэміях, вышэйшых і сярэдніх ваен. вучылішчах. *У. М. Канаплянік.*

«ВАЕННЫЯ СЯБРЫ», тайнае рэвалюц. таварыства ў Літоўскім асобным корпусе (Гродзенская губ.). Створана ў 1825 М. І. Рукевічам; чл.: капітан К. Г. Ігельстром, паручнік А. І. Вегелін, падпаручнікі Вільканец, Гофман, Завадскі, Пятроўскі, радавы А. Трэбінскі, чыноўнік Л. Уронскі, І. Высоцкі і інш. Звязана з інш. т-вамі. «В. с.» ставілі сваёй мэтай барацьбу за «вольнасць» і «ўсеагульны дабрабыт». Па паліт. ідэалах бліскія да Паўн. т-ва дзекабрыстаў. У снеж. 1825 чл. т-ва арыштаваны за спробу сарваць прысягу Мікалаю I палкоў, якія знаходзіліся ў раёне Беластока, і прыгавораны да катаргі і ссылкі. Адбывалі кару з дзекабрыстамі.

Літ.: Ольшанский П. Н. К вопросу о связях декабристов с польским освободительным движением (Литовский корпус. Общество военных друзей), у кн.: Из истории революционного движения в России в XIX — начале XX вв., М., 1958 (Ученые записки Академии общественных наук при ЦК КПСС, 1958, в. 36).

ВАЁМІНГ (Wyoming), штат на Горным Захадзе ЗША. Пл. 253,6 тыс. км². Нас. 330 тыс. чал. (1968). Адм. ц. Шаен. ПнУ заняты часткай Вялікіх раўнін, астатняя тэр. Скалістымі гарамі. Есць нафта, прыродны газ, каменны вугаль, уранавая і жал. руда, буд. матэрыялы. Кантынентальны засушлівы клімат. Пашавая жывёлагадоўля (пераважна буйн. раг. жывёла). У земляробстве гал. культуры — сеяныя травы, на У — пшаніца. На арашальных землях — цукр. буракі, авёс, ячмень. Здабыча нафты і урану. Нафтаперапрацоўка. Лясная гаспадарка. В. перасякаецца транскантынентальнай чыгункай. Ёлаўстонскі нац. парк і інш. паркі на тэр. В. вабяць турыстаў.

ВАЖКА, возера ў бас. р. Вяты (Храброўкі), левага прытока Зах. Дзвіны, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 3,04 км². Даўж. 2,63 км, найб. шыр. 1,8 км, сярэдняя 1,11 км, сярэдняя глыб. 2,29 м, найб. 5,1 м. Катлавіна круглявая. Схілы спадзістыя, стромкія на поўдні. Усх. і паўн. схілы ўкрыты лесам, на зах.— ворныя землі. У паўн.-ўсх. частцы возера 2 а-вы (агульная пл. 4 га). Вадазбор (22,2 км²) узгорыста-марэнны і нізінны. В. шырокай пратокай злучана з воз. Луша. Водзяцца плотка, лешч, шчупак, акунь, лінь.


ВАЖА-ПШАВЕЛА [сапр. Лука Разікашвілі; 14(26).7.1861, с. Чаргалі ў Пшавіі — 27.6(9.7).1915], грузінскі пісьменнік. Сын свяшчэнніка. Скончыў Гарыйскую наст. семінарыю (1882). Настаўнічаў у вясковай школе. Выступаў у абарону сялян. Выжыты са школы, працаваў на с. гасп. Светапогляд В.-П. сфарміраваўся пад уплывам В. Бялінскага і М. Чарнышэўскага. У 1879 выступіў у друку з этнагр. нарысамі, у 1881 з вершамі. У лірыцы і ў паэмах услаўляў суровую мараль і гераіку першабытнай пшаўскай абшчыны, выкарыстоўваў пшаўскі дыялект. З усіх груз. паэтаў найб. блізкі да нар. паэтычнага мыслення. Гал. тэма яго паэзіі — жыццё і быт горцаў. Узбагаціў груз. л-ру ўзорамі высокай лірыкі, быў схільны да элегічнага роздуму. Найб. значныя яго дасягненні ў эпасе. Лепшыя паэмы: «Бахтрыёні» (1892), «Госць і гаспадар» (1893), «Алуда Кетэлауры» (1889), «Гагатур і Апшына» (1887), «Этэры» (1890), філас. паэма «Змееед» (1901). На падзеі 1905 адгукнуўся песнямі «Даўняя песня воінаў», «Берыкаулі» і інш.; шэрагам артыкулаў і карэспандэнцый. Яго публіцыст. артыкулы 1905—07 нагадваюць рэв. пракламацыі той эпохі. Пісаў апавяданні, п'есы, нарысы. Паасобныя вершы В.-П. пераклі на бел. мову С. Грахоўскі, М. Хведаровіч.



Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, Тбилиси, 1961; Стихи. Поэмы, М., 1960; Стихотворения и поэмы, Л., 1969.
Літ.: Лундберг Е. и Гогоберидзе Е. Важа Пшавела, 4 изд., М., 1969.

ВАЗА, Васа (швед. Vasa, польск. Waza), шведская [1523—1654] і польская [1587—1668] каралеўская дынастыя. Заснавана швед. дваранінам Вазам, які ўзначаліў нар. барацьбу супраць дацкіх феадалаў. Асабліва ўзмацнілася Швецыя пры Карле IX [1604—11] і Густаве II Адольфе [1611—32]. Прадстаўнік швед. дынастыі Зыгмунт III стаў польскім каралём [1587—1632; у 1592—1604 быў адначасова каралём Швецыі]. Ён і яго сыны Уладзіслаў IV [1632—48], Ян Казімір [1648—68] вялі з Маскоўскай дзяржавай. Пры іх Польшча прыйшла ў заняпад.

ВАЗА (лац. vas), посуд утылітарнага і дэкаратыўнага прызначэння. У старажытнасці ў ёй хавалі прадукты, пераносілі ваду і віно. Выкарыстоўвалася ў культавых мэтах.



Асноўныя тыпы старагрэчаскіх вазаў: *1* — піфас; *2* — амфара; *3* — кратэр; *4* — гідрыя; *5* — айнахоя; *6* — кіяф; *7* — кілік; *8* — канфар; *9* — фіялка; *10* — скіфас; *11* — рытон; *12* — арыбал; *13* — піксіда; *14* — лекана; *15* — лекіф; *16* — псіктэр; *17* — лагін.

Мелі разнастайныя формы (старагрэч. *амфара* і кратэр, фігурныя вазы Ст. Перу і інш.). В. упрыгожвалі арнаментам, сюжэтнымі кампазіцыямі, скульптурай. Высокамастацкія В. стварылі старагрэч. майстры (гл. *Вазапіс*). З дэкаратыўнымі мэтамі В. выкарыстоўвалі ў Кітаі, Японіі, пазней у краінах Еўропы. В. робяць з фарфору, шкла, керамікі, каменю, металу, косці і інш. З 2-й пал. 18 ст. ў афармленні рус. інтэр'ера пашырыліся В. з фарфору, шкла, каляровага каменю. Вядомы В., зробленыя па праектах выдатных рус. архітэктараў А. Вараніхіна, К. Расі і інш. Вял. калекцыю В. маюць Эрмітаж і Рус. музей (Ленінград).

Літ.: Салтыков А. Б. Избранные труды, М., 1962, с. 555—570.

ВАЗАПІС, галіна мастацтва Стараж. Грэцыі, а-воў Эгейскага м., грэчаскіх гарадоў Малой Азіі, Паўд. Італіі.

У В. ўжываўся т. зв. лак чорнага і карычневага колеру, вадзяныя фарбы, якімі ўкрываўся белы грунт, часам пазалота. З пач. 1-га тысячагоддзя да н. э. да 7 ст. да н. э. панаваў геам. стыль. Вазы аздабляліся лінейным арнаментам, а з 8 ст. да н. э. на а-вах Родас, Хіпс, Самас пачаў развівацца арыенталістычны стыль. У 6 ст. да н. э. пашыраюцца чорнафігурная тэхніка В. (Атыка, Карынф, Спарта, Клазамены). Першае месца займае Атыка, дзе працавалі майстры Эксекій, Амасіс і інш. Каля 530 да н. э. ў Атыцы ўзнікае чырвонафігурная тэхніка В., росквіт якой цягнецца да сярэдзіны 5 ст. да н. э. Выдатныя майстры Еўфроній, Еўтымід, Дурыс, Брыг. У 2-й пал. 5 ст. да н. э. майстры В. ўсё больш перайманоць прыёмы манумент. жывапісу (Мідый), што паступова вядзе да заняпаду В. ў Атыцы. 4 ст. да н. э.— перыяд росквіту В. ў Паўд. Італіі (апулійская, этруская, кампанская, луканская майстэрні). У эліністычны перыяд развіваецца паліхромны В. у Егіпце (Гадра) і Італіі (Чэнтурыпе).


Літ.: Блаватский В. Д. История античной расписной керамики, М., 1953; Максимова М. И. Античные фигурные вазы, т. 1, М., 1916. *І. І. Саверніна.*

ВАЗАРЫ (Vasari) Джорджа (30.7.1511, Арэцца — 27.6.1574), італьянскі архітэктар, жывапісец і гісторык мастацтва. Прадстаўнік *маньерызму*. Аўтар першых жыццеапісанняў італьян. мастакоў эпохі Адраджэння (1550, 2 выд. 1568). Заснавальнік Фларэнтыйскай акадэміі рысунка (1562). Арх. работы: уласны дом (1542, музей В.) і Палацца дэле Лоджэ (1573) у Арэцца; віла папы Юлія III у Рыме (пачынаў будоўлю Дж. Віньёла, канчаў В. з Б. Амананці, 1550—59); будынкі герцагскай канцылярыі — т. зв. вуліца Уфіцы ў Фларэнцыі (1560—73, канчаў Б. Буанталенці), Палацца дэі Кавальеры ў Пізе (1566). Жывапісныя работы: фрэскі ў зале Паўла III у палацы Канчэлерыя ў Рыме (1546), у Палацца Век'ё ў Фларэнцыі (з 1555), у Зале Рэджа ў Ватыкане (1571—73).

Тв.: Рус. пер.— Жизнеописания наиболее знаменитых живописцев, ваятелей и зодчих, т. 1—2, М., 1956—63.
Літ.: Studi Vasariani, Firenze, 1952.

ВАЗАЎ Іван Мінчаў [27.6(9.7).1850, Сопат (з 1950 Вазаўград) — 22.9.1921], балгарскі пісьменнік. З сям'і гандляра. Удзельнік руху за нац. вызваленне Балгарыі. Жыў у эміграцыі ў Румыніі (1876—77) і Расіі (1887—89). Друкавацца пачаў у 1870. Блізкая да нар. паэзіі лірыка В. прасякнута нац.-вызв. ідэямі, дэмакратызмам, любоўю да балг. прыроды (зб. «Сцяг і гусла», 1876; «Гора Балгарыі», 1877; «Вызваленне», 1878; «Гусла», 1881; «Палі і лясы», 1884; «Песні бадзягі», 1899; «Пад нашым небам», 1900;

Узоры вазапісу: кратэр геаметрычнага стылю. 8 ст. да н. э. Нац. музей. Афіны (злева); кратэр Клітыя і Эргатыма (ваза Франсуа). Чорнафігурны стыль. 2-я чвэрць 6 ст. да н. э. Археал. музей. Фларэнцыя (у цэнтры); стамнас чырвонафігурнага стылю. Пасля 440 г. да н. э. Музей антычнага мастацтва. Мюнхен.





цыкл ліра-эпічных паэм «Эпапея забытых», 1881—84). Вялікае месца ў творчасці В. займае тэма рус.-балг. дружбы (верш «Расія» і інш.). Найб. значны раман «У ярме» (1889—90) — рэаліст. эпапея барацьбы балг. народа супраць тур. прыгнёту. Майстар кароткага рэаліст. апавядання (аб. «Драпіны і плямы», т. 1—2, 1893—95). Аўтар аповесцей («Занядбаныя», 1883—84), выкрывальнай камедыі «Шукальнікі цёплых месцейкаў» (1903), гістор.-патрыят. драм «Да бездані» (1908), «Барыслаў» (1909), «Івайла» (1911). Вялікі ўплыў на В. зрабілі А. Пушкін, М. Лермантаў, М. Някрасаў, М. Гогаль.

Тв.: Събрани съчинения, т. 1—20, София, 1955—57; бел. пер.— У прме, Мн., 1955; у кн.: Скарб, Мн., 1967; рус. пер.— Соч., т. 1—6, М., 1956—57.
Літ.: Иван Вазов. Биобиблиогр. указатель, М., 1962.

ВАЗЕЛІН (франц. vaseline), сумесь мінер. масла і цвёрдых парафінавых вуглевадародаў. Белая або жаўтаватая мазепадобная маса без паху і смаку. Т-ра кроплепадзення 37—50 °С; шчыльн. 870—885 *кг/м*³. Раствараецца пры награванні ў спірце. Атрымліваюць В. з нафты. Выкарыстоўваюць на медыцынскія, фармацэўтычныя, касметычныя патрэбы і ў тэхніцы.

ВАЗНЯСЁНСКІ, пасёлак у Леніпскім с/с Чачэрскага р-на Гомельскай вобл., на р. Сож. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 7 *км* на Пд ад Чачэрска, 65 *км* ад Гомеля, 37 *км* ад чыг. ст. Буда-Кашалёўская. 96 ж., двароў 50 (1970). Маслазавод. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. У Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 11 жыхароў пасёлка.

ВАЗНЯСЁНСКІ Аляксандр Мікалаевіч [5 (17).7.1888, с. Чукалы Сімбірскай губ.— 16.1. 1966], рускі і беларускі савецкі літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1944). Скончыў Варшаўскі ун-т (1913). Прафесар Беларускага (1921—30) і Казанскага (1939—66) ун-таў, ін-таў кінематаграфіі і педагагічнага (1930—34) у Маскве. Друкавацца пачаў у 1913. Працы пра творчасць М. Навікова, М. Лермантава, М. Гогаля, І. Катлярэўскага, І. Тургенева, Т. Шаўчэнкі, па агульных пытаннях метадалогіі л-ры.



Вывучаў і папулярызаваў бел. л-ру. Аўтар арт. «Сучасны беларускі тэатр (21—26 год)» (1927), «Другі Беларускі дзяржаўны тэатр» (1929), «Перспектывы сучаснага беларускага тэатра» (1930). Даследаванні В. па бел. л-ры і т-ры апублікаваны на бел., рус., укр., ням., чэшскай і харвацкай мовах.

Тв.: Паэтыка М. Багдановіча, Коўна, 1926; Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускай навукі аб літаратуры, Мн., 1927; Паэмы Янкі Купалы (Сюжэтная пабудова і стыль), Мн., 1927; Ля вытокаў мастацкай прозы Якуба Коласа, «Полымя», 1928, № 8, 1929, № 1—4.
Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 32—34.

Ю. С. Пшыркоў. Мінск.

ВАЗНЯСЁНСКІ Мікалай Аляксеевіч (1.12. 1903, в. Цёплае Чэрскага пав. Тульскай губ.— 30.9.1950), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. Акад. АН СССР (1943). Чл. КПСС з 1919. Скончыў Камуністычны ун-т імя Свярдлова (1924). На парт. рабоце ў Туле, Данбасе, Ленінградзе. У 1928—31 вучыўся, пасля працаваў у Ін-це чырвонай прафесуры. З 1938 старшыня Дзяржплана СССР. У 1939—50 нам. старшыні СНК СССР. У Айч. вайну чл. Дзяржаўнага камітэта абароны, з 1943 чл. Камітэта пры СНК СССР па аднаўленні гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад фаш. акупацыі. З лютага 1941 кандыдат у чл., з 1947 чл. Палітбюро ЦК ВКП(б). На XVII з'ездзе ВКП(б) (1934) выбраны чл. Камісіі сав. кантролю, на XVIII з'ездзе (1939) чл. ЦК ВКП(б). Дэп. Вярх. Савета РСФСР 1-га скл. і Вярх. Савета СССР 2-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна. Аўтар прац па эканоміцы, асн. з іх — «Ваенная эканоміка СССР у перыяд Айчыннай вайны» (1947). Дзярж. прэмія СССР 1948.



Літ.: Колотов В. и Петровичев Г., Н. А. Вознесенский, М., 1963.

ВАЗНЯСЁНСКІ Фёдар Сяргеевіч [3(16).4. 1916, в. Лосева Асташкаўскага пав. Цвярской губ.— 3.7.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з жн. 1941. Вызначыўся 22.6.1944 у рукапашным баі ў час прарыву абароны праціўніка каля Сіроціна Віцебскай вобл.; 24.6.1944 пры фарсіраванні Зах. Дзвіны і ў баі за плацдарм. Загінуў у баі каля в. Троіцкае Ветрынскага р-на Віцебскай вобл.

ВАПГАЧ, востраў у Паўн. Ледавітым акіяне, на мяжы Баранцава і Карскага мораў, у Архангельскай вобл. Ад мацерыка аддзелены пралівам Югарскі Шар, ад Новай Зямлі — пралівам Карскія Вароты. Пл. 3,4 тыс. *км*². Выш. да 171 *м*. На зах. берагах шмат заліваў, усходнія парэзаны слаба. Паверхня ўкрыта тундравай расліннасцю. На ўзбярэжжы пасёлкі Вайгач і Варнек.

ВАЙДА (Wajda) Анджэй (н. 6.3.1926, г. Суралкі), польскі кінарэжысёр. У 1954 скончыў Дзярж. вышэйшую кінашколу ў Лодзі. Асн. тэма творчасці В.— біяграфія пакалення, юнацтва якога супала з 2-й сусв. вайной. Лепшыя работы: ваен. трылогія «Пакаленне» (1955), сусв. вядомыя «Канал» (1957) і «Попел і дыямент» (1958, прэмія на 20-м Міжнар. кінафестывалі ў Венецыі, 1959). Тэма вайны таксама ў фільмах «Лятучая» (1959), «Самсон» (1961). Да эпохі напалеонаўскіх войнаў В. звяртаецца ў фільме «Попел» (1965). Сучаснасці прысвечаны фільмы «Бязвінныя чарадзеі» (1960), «Каханне ў 20 гадоў» (1962), «Усё на продаж» (1968).

Літ.: Черненко М. Анджей Вайда, М., 1965.

ВАЙДЭЛОТЫ (вейдалоты), язычніцкія жрацы старадаўняй Літвы, хавальнікі вечнага агню бога Перуна (Перкунаса). Вайдэлоткі ахоўвалі вечны агонь пры храме багіні Праўрымы, прыносілі ахвяры багам. У час баляў і на святы В. спявалі і ўслаўлялі подзвігі продкаў, расказвалі пра барацьбу з іншаземнымі заваёўнікамі. Песні і легенды В. доўгі час бытавалі ў народаў Вял. кн. Літ. і пасля таго, як было прынята хрысціянства.

ВАЙЗУЛІН Ікрам Халімавіч (н. 14.12.1919, в. Туктар Мамадышскага пав. Казанскай губ.), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1944. З чэрв. 1941 у Чырв. Арміі; з чэрв. 1942 у партызанах — камандзір аддзялення, палітрук, камандзір узвода. З лют. 1943 нам. камандзіра брыгады, з жн. камісар *партызанскай брыгады 1-й Смаленскай* Віцебскай вобл. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Наваполацку.

ВАЙМА, гл. *Шчытазборачны станок.*

ВАЙНА, арганізаваная ўзброеная барацьба паміж дзяржавамі, нацыямі або класамі для дасягнення пэўных паліт. і эканам. мэт, працяг палітыкі класаў і дзяржаў насільнымі сродкамі. Марксізм-ленінізм падзяляе В. на справядлівыя і несправядлівыя. Справядлівыя накіраваны на абарону айчыны ад знешняга нападу і заняволення (айчынныя В.), вызваленне народа ад рабства капіталізму, ліквідацыю нац. прыгнёту (В. нацыянальна-вызваленчыя, *грамадзянская вайна*). Несправядлівыя, рэакц. В. накіраваны на захоп чужых тэр., заняволенне народаў, перадзел свету (напр., імперыялісг. В.). У залежнасці ад змены паліт. абставін характар В. можа змяніцца: справядлівая можаператварыцца ў несправядлівую і наадварот.

Узнікненне В. як грамадскай з'явы звязана з узнікненнем прыватнай уласнасці, класаў, што спараджае эканам. і сацыяльна-паліт. няроўнасць людзей і дзяржаў, сістэму класавага і нац. прыгнечання, сац. антаганізмы. З узнікненнем прыватнай уласнасці і класаў ствараецца армія як самы важны інструмент дзяржавы. Асн. вытокі сучасных В.— капіталіст. сістэма гаспадаркі з уласцівымі ёй непрымірымымі ўнутранымі супярэчнасцямі, якія асабліва ўзмацняюцца ў эпоху імперыялізму, калі закон нераўнамернасці эканам. і паліт. развіцця капіталіст. краін прыводзіць да абвастрэння супярэчнасцей паміж імі, да барацьбы за перадзел свету, за насільнае перараэмеркаванне сфер уплыву на сусв. рынку, за сусв. панаванне. Мілітарызм заўсёды быў неад'емнай рысай імперыялізму. У гэтую эпоху В. звычайна становяцца сусветнымі. Імперыялізм — вінаўнік дзвюх сусветных В. (гл. *Першая сусветная вайна 1914—18* і *Другая сусветная вайна 1939—45*). У гэтых войнах загінула звыш 60 млн. чал., тады як ва ўсіх войнах за 3 папярэднія стагоддзі загінула каля 25 млн. чал. Ваен. выдаткі склалі больш як 1588 млрд. долараў, страты матэрыяльных каштоўнасцей — больш як 4338 млрд. долараў. Агрэсіўныя В. разглядаюцца ідэолагамі імперыялізму як натуральны сродак вырашэння ўсіх міжнар. пытанняў. Пасля 2-й сусв. В. імперыялісты развязалі больш як 30 войнаў і ажыццявілі сотні ўзбр. акцый. Ваен. выдаткі ЗША ў 1946—68 склалі 1050 млрд. дол., што ў 2 з лішкам разы больш, чым за ўсю папярэднюю гісторыю краіны. Варварская В. імперыялізму ЗША ў В'етнаме, ізраільская агрэсія супраць арабскіх народаў на Б. Усходзе, падрыўныя дзеянні амер. імперыялізму супраць рэвалюц. Кубы, рэваншысцкі курс заходнегерманскіх мілітарыстаў, падкопы каланіялізму і неакаланіялізму ў краінах Азіі, Афрыкі і Лац. Амерыкі, падрыхтоўка новай сусветнай В.— усё гэта пацвярджэнне імкненняў імперыялісг. сіл павярнуць назад развіццё сучаснага свету. Над чалавецтвам навісла пагроза знішчальнай ядзернай В. Запасы яд. зброі ЗША ацэньваюцца ў 25 000 мегатон. Гэта 12 500 патэнцыяльных ядз. выбухаў, кожны з якіх здольны забіць усё жывое ў радыусе 300 *км*.

Міжнар. нарада камуніст. і рабочых партый у Маскве (1969) адзначыла, што агрэсіўнасць імперыялізму ўзмацнілася, ён імкнецца ўсялякімі спосабамі аслабіць пазіцыі сацыялізма, задушыць нац.-вызв. рух народаў, перашкодзіць барацьбе працоўных у капіталіст. краінах, затрымаць непазбежны працэс заняпаду капіталізму. Пакуль існуе імперыялізм, будзе існаваць і небяспека В. Імперыялізм, і перш-наперш амерыканскі, нарошчвае гонку ўзбраення, абвастрае міжнар. напружанасць, стварае канфлікты і распальвае лакальныя В. Але ва ўмовах, калі імперыялізм перастаў адыгрываць гал. ролю ў міжнар. адносінах і ўсё большую ролю адыгрывае сацыяліст. сістэма, калі ўзмацніўся ўплыў дзяржаў, якія заваявалі нац. незалежнасць, і народных мас капіталіст. краін, існуе рэальная магчымасць не дапусціць сусветнай В. Прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным сац. ладам, прапанаваны У. І. Леніным,— аб'ектыўная неабходнасць развіцця сучаснага грамадства. Здольнасць міралюбных сіл папярэдзіць новую сусветную В. не азначае, што ў цяперашні час выключана ўсякая магчымасць узнікнення В. Пытанне пра В. і мір — гал. пытанне сучаснасці. У эпоху небывалага прагрэсу ваен. тэхнікі, росту сродкаў масавага знішчэння людзей гэта пытанне жыцця і смерці соцень мільёнаў людзей. Толькі перамога сацыялізма ва ўсім свеце знішчыць сац. і нац. прычыны ўзнікнення ўсялякіх войнаў.

Літ.: Энгельс Ф. Избранные военные произведения, М., 1956; Ленин В. И. О войне, армии и военной науке, М., 1965; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961, ч. 1, разд. 8; Программные документы борьбы за мир, демократию и социализм, М., 1964; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Москва, 5—17 чэрвеня 1969 года, Мн., 1969.

А. П. Ратайка. Мінск.

ВАЙНА ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ІСПАНСКІХ КАЛОНІЙ У АМЕРЫЦЫ 1810—26, вызваленчая вайна іспанскіх калоній у Амерыцы супраць іспанскага панавання.

Калан. палітыка Іспаніі на захопленых у 16 ст. тэр. Амерыкі стрымлівала эканам. развіццё, стварала рэжым паліт. бяспраўя для насельніцтва. Тры стагоддзі ішла стыхійная барацьба супраць каланізатараў. Вялікі ўплыў на развіццё нац.-вызв. руху ўісп. калоніях зрабіла *вайна за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*, франц. бурж. рэвалюцыя канца 18 ст., барацьба неграў-рабоў Гаі-

ці 1791—1803. Паскорыла падзеі ўварванне арміі Напалеона I у Іспанію (1808—09). Барацьба за незалежнасць ускладнялася сац. супярэчнасцямі ў самих калоніях. Крэолы патрабавалі паліт. правоў, свабоды гандлю і развіцця прамысловасці. Нар. масы — індзейцы, метысы, негры выступалі не толькі супраць іспанцаў, а і супраць памешчыкаў-крэолаў. На першым этапе вайны (1810—15) патрыёты захапілі ўладу ў буйных цэнтрах калоній: Каракасе, Буэнас-Айрэсе, Багаце і інш. У Мексіцы вайна за незалежнасць пад кіраўніцтвам М. Ідальга, потым Х. Марэласа набыла характар масавага дэмакр. руху. У Венесуэле патрыёты пад кіраўніцтвам Ф. *Міранды* і С. *Балівара* двойчы абвяшчалі рэспубліку, якая ў 1814 была знішчана іспан. уладамі. Дэмакр. рух разгарнуўся і ў іншых іспан. калоніях — Уругваі, Ла-Плаце. Была абвешчана незалежнасць Парагвая (1813). Аднаўленне абсалютызму ў Іспаніі, здрада памешчыкаў-крэолаў памаглі Іспаніі ў 1815 аднавіць сваю ўладу ва ўсіх амер. калоніях, акрамя Ла-Платы. Другі этап вайны пачаўся ў 1816 паходам Балівара ў Венесуэлу. Абвешчаная ім дэмакр. праграма вызвалення рабоў, раўнапраўя каляровага насельніцтва з белым, скасавання падаткаў з індзейцаў, надзялення зямлёй удзельнікаў вайны спрыяла разгортванню вызв. руху. У 1819 армія Балівара вызваліла Новую Гранаду. Была абвешчана рэспубліка Вялікая Калумбія (1819—30) у складзе Венесуэлы, Новай Гранады, Кіта. Пасля абвяшчэння незалежнасці Злучаных правінцый Ла-Платы (1816) армія пад кіраўніцтвам Х. *Сан-Марціна* разбіла іспанцаў у Чылі (1818) і Перу (1821). Барацьба за незалежнасць Мексікі, Цэнтр. Амерыкі скончылася перамогай патрыётаў у 1821. Адначасова ішла барацьба Бразіліі за вызваленне ад Партугаліі, якая таксама скончылася перамогай (1822). Армія Балівара вызваліла Верхняе Перу (у 1825 абвешчана незалежнасць, краіна названа Балівіяй). У студз. 1826 у перуанскім порце Кальяо капітуляваў апошні іспан. гарнізон. Усе іспан. калоніі ў Амерыцы (акрамя Кубы і Пуэрта-Рыка) завалявалі незалежнасць.

Вайна за незалежнасць была незавершанай бурж. рэвалюцыяй. Улада перайшла да буйных памешчыкаў-крэолаў. Захавалася сістэма феад. эксплуатацыі. Разам з тым стварыліся ўмовы для развіцця капіталізму ў Лац. Амерыцы.

Літ.: Война за независимость в Латинской Америке (1810—1826), М., 1964; Фостер У. З. Очерк политической истории Америки, [пер. з англ.], 2 изд., М., 1955.

М. П. Палетыка. Мінск.

ВАЙНА ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ У ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫЦЫ 1775—83, вызваленчая рэвалюц. вайна англійскіх калоній у Паўн. Амерыцы, у ходзе якой створана незалежная дзяржава — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Развіццё капіталізму ў англ. калоніях у Паўн. Амерыцы абвастрыла супярэчнасці паміж імі і метраполіяй. Англія імкнулася захаваць свае калоніі як пастаўшчыкоў сыравіны і рынкі збыту, таму штучна стрымлівала ў іх развіццё прамысловасці, гандлю. Гэтая палітыка асабліва настойліва праводзілася пасля *Сямігадовай вайны* 1756—63 (пераможнай для Англіі), калі англ. буржуазія спрабавала спыніць рост эканам. незалежнасці калоній. Урад метраполіі забараніў засяленне ўрадгор (1763), увёў у калоніях падаткі: гербавы збор (1765), пошліну на тавары, якія завозіліся з Англіі (законы Таўншэнда, 1767), і інш., што выклікала нездаволенасць усіх колаў насельніцтва. Асобныя паўстанні прывялі да ўзбр. сутычак з англ. войскамі і стварэння першых рэвалюц. органаў улады — «Камітэтаў бяспекі» (1772). У 1773 жыхары Бостана выкінулі ў мора вялікую партыю чаю, прывезеную англ. караблямі (т. зв. «Бостанскае чаяванне»). Англія ўжыла рэпрэсіі супраць Бостана, што яшчэ больш абвастрыла становішча ў калоніях. 1-ы Кантынентальны кангрэс (1774) прадстаўнікоў калоній заклікаў да байкоту англ. тавараў, што паставіла пад пагрозу інтарэсы англ. буржуазіі. Англія аб'явіла калоніі мяцежнымі і пачала супраць іх ваен. дзеянні. У першых сутычках з англ. войскамі капітана Конкарда і Лексінгтана (1775) амер. паўстанцы ўжылі новую тактыку рассыпнога строю і перамаглі англ. войскі. Барацьба за незалежнасць ускладнялася супярэчнасцямі ў самих калоніях. Буйныя землеўладальнікі і плантатары, а таксама частка буржуазіі, звязаныя з англ. капіталам і адміністрацыяй (т. зв. амер. торы, ці лаялісты), арыентаваліся на Англію. Нар. масы — фермеры, арандатары, рабочыя, дробная буржуазія (левае крыло амер. вігаў, прыхільнікаў незалежнасці) — патрабавалі свабоднага доступу да зямель (скасавання), паліт. раўнапраўя, стварэння незалежнай дэмакр. амер. дзяржавы. Частка буржуазіі, плантатараў, землеўладальнікаў (правае крыло вігаў) у сваіх патрабаваннях свабоды развіцця прамысловасці і гандлю вагалася і шукала пагаднення з Англіяй. Пад націскам рэвалюц. мас 2-і Кантынентальны кангрэс у 1775 рэарганізаваў атрады паўстанцаў у армію; галоўнакамандуючым быў прызначаны Дж. *Вашынгтон*. 4.7.1776 кангрэс прыняў «Дэкларацыю незалежнасці» пра аддзяленне амер. калоній ад Англіі і ўтварэнне незалежнай дзяржавы. Гэта быў першы ў гісторыі дзярж.-прававы дакумент, які абвясціў суверэнітэт народа і асновы бурж.-дэмакр. свабод. У 1777 кангрэс прыняў рашэнне пра канфіскацыю ўласнасці лаялістаў, зямель кароны і англіканскай царквы і прыняў першую канстытуцыю ЗША, якая замацавала суверэнітэт асобных калоній (штатаў). У ваен. дзеяннях 1775—77 перавага была на баку англічан. Гэтаму спрыялі грамадз. вайна ў калоніях, адрада вышэйшага камандавання, слабасць цэнтр. улады, недахоп боепрыпасаў, дыверсіі лаялістаў. Актыўна ўдзельнічаў у вайне негрыцянскі народ. Пасля таго як у кастр. 1777 войска Вашынгтона акружыла і прымусіла капітуляваць 6-тысячную англ. армію каля Саратогі, у ходзе вайны настаў пералом. Спрыяльна склалася міжнар. становішча ЗША. У 1778 ваен. саюз з імі заключыла Францыя, якая спадзявалася вярнуць сабе Канаду. У 1779 у вайну з Англіяй уступіла Іспанія, у 1780 — Галандыя. Расія ўскосна таксама садзейнічала перамозе калоній. У 1780 яна ўзначаліла «Лігу нейтральных», якая выступіла на абарону марскіх перавозак і гандлю з краінамі, працоўнікамі Англіі. Паход англ. арміі ў паўд. штаты (1779—81) скончыўся капітуляцыяй яе каля Йорктаўна. Пагроза вайны амаль з усёй Еўропай, немагчымасць блакады амер. портаў, паражэнні на сушы і моры прымусілі Англію ў 1783 падпісаць Версальскі мірны дагавор і прызнаць поўную незалежнасць ЗША.

Вайна за незалежнасць была незавершанай бурж. рэвалюцыяй. Яна ліквідавала перашкоды для развіцця капіталізму, стала для еўрап. буржуазіі прыкладам барацьбы супраць абсалютызму і феадалізму, дала штуршок вызв. руху ў Лац. Амерыцы.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 756—765; Фурсенко А. А. Американская буржуазная революция XVIII века, М.— Л., 1960; Фостер У. З. Очерк политической истории Америки, [пер. з англ.], 2 изд., М., 1955.

М. П. Палетыка. Мінск.

ВАЙНЕРТ (Weinert) Эрых (4.8.1890, Магдэбург — 20.4.1953), нямецкі паэт. Чл. КПГ з 1924. Сын інжынера. У 1-ю сусв. вайну ваяваў з рэвалюц. рухам. Літ. дзейнасць пачаў у 1921 антыімперыяліст. вершамі. Паэзія В. цесна звязана з барацьбой ням. пралетарыяту (аб. «Балаган», 1925; «Эрых Вайнерт гаворыць», 1930). Пасля прыходу Гітлера да ўлады эмігрыраваў у Швейцарыю. З 1935 да 1946 (з перапынкам) жыў у СССР. У 2-ю сусв. вайну быў старшынёй антыфаш. камітэта «Свабодная Германія». Аўтар зб. «Да нямецкіх салдатаў» (1942), «Супраць сапраўднага ворага» (1944), «Camaradas» (1951). Вярнуўшыся на радзіму (1946), актыўна ўключыўся ў сацыяліст. буд-ва ў ГДР. Зб. «Другі раздзел сусветнай гісторыі» (1947) прысвяціў СССР. Нац. прэміі 1949 і

1952. Пасля смерці В. Саюз свабодных ням. моладзі ўстанавіў медаль яго імя.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1965.
Літ.: Троянкер В. С. Эрих Вайнерт. Библиогр. указатель, М., 1953.

ВАЙНІЛАВА, вёска ў Чэрвеньскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Свярдлова. За 7 *км* на ПнЗ ад Чэрвеня, 60 *км* ад Мінска, 36 *км* ад чыг. ст. Пухавічы. 215 ж., двароў 61 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін, майстэрня для рамонту с.-г. тэхнікі.

ВАЙНІЛЫ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «XVIII партз'езд». За 18 *км* на З ад Чавусаў, 25 *км* ад Магілёва, 6 *км* ад чыг. ст. Раста, каля шашы Магілёў — Чавусы (3 *км*). 716 ж., двароў 251 (1970). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячыя яслі, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін.

ВАЙНІРУБ Мацвей Рыгоравіч [н. 2(15).5.1910, г. Барысаў], Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1941), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1953). На фронце з 1941. Камандаваў бранятанкавымі і механізаванымі войскамі 8-й гвардз. арміі, якая з баямі прайшла ад Волгі да Берліна. Вызначыўся ў студз. 1945 пры прарыве ўмацаванай палосы абароны ворага на зах. беразе Віслы на Пд ад Варшавы. Генерал-лейтэнант В. служыць у Савецкай Арміі.



ВАЙНІРУБ Яўсей Рыгоравіч [н. 15(28).5.1909, г. Барысаў], Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1937. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1941). Летам 1941 у складзе танкавай дывізіі абараняў Беларусь, удзельнічаў у баях пад Арлом, у вызваленні Беларусі. Са снеж. 1944 палкоўнік В. камандаваў танкавай брыгадай, якая вызначылася ў час Вісла-Одэрскай аперацыі. За 2 месяцы баёў брыгада вызваліла больш за 400 гарадоў і населеных пунктаў Польшчы. Жыве ў Мінску.



ВАЙНІЮНЦЫ, вёска ў Далёцкім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на зах. беразе воз. Белае. Цэнтр калгаса «Перамога». За 26 *км* на ПдЗ ад Браслава, 260 *км* ад Віцебска, 50 *км* ад чыг. ст. Дукштас (Літ. ССР). 145 ж., двароў 41 (1970). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак.

ВАЙСКАЯ, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Беларусь». За 13 *км* на З ад Камянца, 52 *км* ад Брэста, 17 *км* ад чыг. ст. Высока-Літоўск. 230 ж., двароў 78 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, дзіцячы сад, аддз. сувязі, магазін. Помнік У. І. Леніну.

ВАЙСКОВАЯ СЛУЖБА (воінская служба), дзярж. служба ў складзе ўзброеных сіл; выконваецца грамадзянамі ў абавязковым або добраахвотным парадку, а таксама па найме. Уключае абавязковую службу ў мірны час і непасрэдны ўдзел у ваен. дзеяннях у час вайны. З сярэдзіны 20 ст. ў большасці дзяржаў існуе абавязковая вайск. павіннасць. В. с. складаецца з абавязковай службы і знаходжання ў запасе арміі і флоту (у рэзерве — каля 30 гадоў). У СССР у адпаведнасці з законам «Аб усеагульным воінскім абавязку» ад 12.10.1967 В. с. абавязаны праходзіць усе мужчыны — грамадзяне СССР, незалежна ад расавай і нац. прыналежнасці, веравызнання, адукацыі, аселасці, сац. і маёмаснага становішча, якім да дня прызыву спаўняецца 18 гадоў.

На дзейную В. с. прызываюцца 2 разы ў год (май — чэрв. і ліст.— снеж.). Тэрмін службы для салдатаў, сяржантаў, матросаў і старшын у залежнасці ад віду ўзброеных сіл вызначаны ад 1 да 3 гадоў. Ваеннаслужачыя, якія адбылі тэрмін абавязковай вайск. службы, звальняюцца ў запас.

ВАЙСКОВЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ, небяспечныя для грамадства дзеянні, якія накіраваны супраць парадку нясення вайсковай службы, учыненыя ваеннаслужачымі, а таксама ваеннаабавязанымі ў час праходжання імі вучэбных збораў. Адказнасць за В. з. прадугледжана агульнасаюзным законам «Аб крымінальнай адказнасці за вайсковыя злачынствы» (1958), які без змены ўключаны ў крымін. кодэксы саюзных рэспублік (разд. 16 КК БССР). Строгае і дакладнае выкананне парадку нясення вайск. службы — аснова воінскай дысцыпліны і адна з найважн. умоў умацавання баяздольнасці Узброеных Сіл СССР.

У залежнасці ад характару парушэння парадку нясення вайск. службы В. з. падзяляюцца на групы: злачынствы супраць парадку падначаленасці і воінскага гонару (непадпарадкаванне, невыкананне загаду, насілле над начальнікам і інш.); ухіленне ад вайск. службы (дэзерцірства, самавольная адлучка і інш.); злачынствы супраць парадку карыстання ваен. маёмасцю і эксплуатацыі ваен. тэхнікі (калі згублена ці папсавана ваен. маёмасць, парушаны правілы ваджання і эксплуатацыі машын і інш.); злачынствы супраць парадку нясення спец. службаў (парушэнне правілаў караульнай, унутранай, пагранічнай службы і інш.); злачынствы супраць парадку захавання ваен. тайны (разгалашэнне ваен. тайны, страта дакументаў, якія змяшчаюць ваен. тайну, і інш.); службовыя В. з. (злоўжыванне ўладай, перавышэнне ўлады, бяздзейнасць улады і нядбайныя адносіны да службы); злачынствы супраць парадку нясення вайск. службы на полі бою і ў раёне ваен. дзеянняў (здача ці пакіданне праціўніку сродкаў вядзення вайны, марадзёрства, насілле над насельніцтвам у раёне ваен. дзеянняў і інш.); добраахвотная здача ў палон і злачынныя паводзіны ў палоне; злачынствы супраць законаў і звычаяў вайны.

Крымін. адказнасць за В. з. могуць несці ваеннаслужачыя; ваеннаабавязаныя ў час праходжання імі вучэбных збораў; асобы афіцэрскага, сяржанцкага і радавога саставу органаў Камітэта дзярж. бяспекі; інш. асобы, у адносінах да якіх ёсць спец. ўказанне ў заканадаўстве Саюза ССР. Пры ўчыненні В. з., якое не мае вялікай грамадскай небяспекі, вінаваты можа быць вызвалены ад крымін. адказнасці з ужываннем мер дысцыплінарнага ці грамадскага ўздзеяння.

Кр.: Сборник Законов СССР и Указов Президиума Верховного Совета СССР. 1938—1967, т. 2, М., 1968, с. 459—470. *В. А. Шкурко.* Мінск.

ВАЙСКОВЫЯ І БАЯВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП(б), арганізацыі партыі па кіраўніцтве рэвалюц. работай у войсках, ваенным абучэнні рабочых, стварэнні баявых дружын для ўзброенага паўстання ў час рэвалюцыі. На Беларусі ўзніклі ў 1902 (гл. *Гродзенская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП*). Колькасць іх выросла ў рэвалюцыю 1905—07, асабліва пасля III з'езду РСДРП, які прыняў пастанову «Аб узброеным паўстанні». У пач. 1906 каля 50 к-таў РСДРП мелі В. і б. а. Найбольшыя: пецярбургская, маскоўская, рыжская; на Беларусі — *Бабруйская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП, ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя пры абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі,* ваенна-рэвалюц. арганізацыя пры Гомельскім раённым к-це РСДРП, *ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя пры Мінскай групе РСДРП, Віцебская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП,* а таксама арг-цыі ў многіх вайск. часцях, раскватараваных на Беларусі. Ваен. арг-цыі выдавалі лістоўкі, пракламацыі, адозвы, газ. «Казарма» (Пецярбург), «Солдатская жизнь» (Масква), «Солдатский листок» (Рыга), *«Солдатская воля»* (Гродна), *«Солдатская жизнь»* (Вільня). 16—22.11.1906 па ініцыятыве У. І. Леніна ў Тамерфорсе праведзена 1-я канфер. В. і б. а. У выніку іх дзейнасці салдаты і маракі актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07, адмаўляліся страляць у рэвалюц. рабочых і сяляні і пераходзілі на іх бок. У 1905—06 у краіне адбылося каля 20 паўстанняў і больш за 200 салдацкіх хваляванняў, у т. л. *Бабруйскага батальёна паўстанне, Баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905, Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906,* хваляванні ў Віцебску, Гродне, Магілёве, Мінску. Разгромленыя пасля рэвалюцыі В. і б. а. адноўлены ў 1-ю сусв. вайну. Пасля Лют. рэвалюцыі бальшавікі ўзмацнілі работу па арганізацыі ўзбр. сіл сацыяліст. рэвалюцыі. У сак. 1917 узнікла Ваен. арг-цыя пры Петраградскім к-це РСДРП [з крас. Ваен. арг-цыя пры ЦК РСДРП(б)]. 16—23.6(29.6—6.7).1917 адбылася Усерас. канферэнцыя франтавых і тылавых арг-цый, якая стварыла Усерас. бюро ваен. арг-цый пры ЦК РСДРП(б). На пач. Кастр. рэвалюцыі ваен. арг-цыі бальшавікоў дзейнічалі ва ўсіх гарнізонах і франтах. Ваен. арг-цыі Зах. фронту адыгралі важную ролю ў звяржэнні самадзяржаўя і Часовага ўрада, у перамозе сацыяліст. рэвалюцыі, стварэнні ўзбр. сіл Сав. Рэспублікі. Распушчаны паводле рашэння ЦК РКП(б) ад 15.3.1918 у сувязі з дэмабілізацыяй старой арміі.

Літ.: Ленін У. І. Рэвалюцыйная армія і рэвалюцыйны ўрад, Тв., т. 8 (Поли. собр. соч., т. 10); яго ж. Урокі Маскоўскага паўстання, Тв., т. 11 (Поли. собр. соч., т. 13); яго ж. Марксізм і паўстанне, Тв., т. 26 (Поли. собр. соч., т. 34); Голуб П. А. Партия, армия и революция, М., 1967; Гапоненко Л. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов. 1917, М., 1953.

У. П. Верхась. Гродна.

ВАЙСКОВЫЯ ПАСЯЛЕННІ, своеасаблівая арганізацыя арміі ў Расіі, якая сумяшчала вайсковую службу з працай на сельскай гаспадарцы (1810—57). Уведзены Аляксандрам I, каб павялічыць армію, зменшыць выдаткі на яе ўтрыманне і стварыць ізаляваную вайск. касту для барацьбы з вызв. рухам.

Першае В. п. створана ў 1810 А. А. Аракчэевым (з 1817 начальнік В. п.) у Клімавіцкім пав. Магілёўскай губ., адтуль прымусова выселілі ў Крым 4 тыс. сялян. На службу ў В. п. бралі мясцовых жыхароў ва ўзросце 18—45 гадоў, жанатых, з уласнай с. гасп., якія праслужылі ў арміі не менш як 6 гадоў. В. п. арганізоўвалі на казённых землях. Да 1825 створаны ў Пецярбургскай, Наўгародскай, Магілёўскай, Віцебскай, Слабодска-Украінскай, Херсонскай, Кіеўскай, Падольскай, Екацярынаслаўскай губ. У іх налічвалася 375 тыс. чал. В. п. не апраўдалі сябе і ў 1857 ліквідаваны.

ВАЙСТРОЎ Дзмітрый Фёдаравіч [н. 26.11(9.12).1906, в. Добрая Горацкага пав. Магілёўскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. У 1930—41 на парт. і сав. рабоце. У кастр. 1941 стварыў партыз. групу, на чале якой дзейнічаў у Горацкім і Дубровенскім р-нах. У лют. 1942 арганізаваў партыз. атрад, ператвораны пазней у партыз. брыгаду; нам. камандзіра, з кастр. 1942 — камандзір. З сак. 1943 узначальваў аддзел Мсціслаўскага падпольнага РК КП(б)Б. З студз. 1944 камісар *партызанскай брыгады № 61* Магілёўскай вобл. З кастр. 1944 на парт. рабоце ў Жлобінскім і Стрэшынскім р-нах. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі. Жыве на радзіме.

ВАЙТОВІЧ Ніна Трафімаўна [н. 27.6(10.7).1913, мяст. Дрыса Віцебскай губ.], беларускі савецкі мовазнавец. Д-р філал. н. (1967). Чл. КПСС з 1940. З сям'і настаўніка. Скончыла Мінскі пед. ін-т (1937), дзе ў 1948—56 загадвала кафедрай бел. мовы. З 1956 у Ін-це мовазнаўства АН БССР. Займаецца дыялекталогіяй і гісторыяй бел. мовы. Аўтар падручніка для 6 кл. «Родная літаратура» (1—16 выд. 1945—60), сааўтар прац «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963), «Нарысы па беларускай дыялекталогіі» (1964), «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968—69).

Тв.: Да пытання аб фарміраванні нацыянальнай літаратурнай беларускай мовы, Мн., 1958; Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі, Мн., 1968.

ВАЙЦАХОВІЧ Сяргей Рыгоравіч [н. 7(20).3.1903, в. Сярагі Слуцкага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў парт. падполля і партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Ка-

муніст. ун-т імя Леніна ў Мінску (1932). У 1921—30 па сав., з 1933 на парт. рабоце ў Слуцку; у 1938—41 інструктар ЦК КП(б)Б. З крас. 1941 сакратар Пінскага абкома, з снеж. сакратар *Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б,* з ліп. 1944 да мая 1947 сакратар Пінскага абкома КП(б)Б. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

ВАЙЦЕХАЎШЧЫНА, вёска ў Малабераставіцкім с/с Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 10 *км* на Пн ад Вял. Бераставіцы, 60 *км* ад Гродна, 22 *км* ад чыг. ст. Бераставіца. 310 ж., двароў 118 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ВАЙЦЕЦКІ Уладзімір Канстанцінавіч (н. 8.3.1933, в. Мярэцкія Дзісенскага пав. Віленскага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1955. З 1949 працуе ў калгасе імя Калініна Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. З 1951 брыгадзір паляводчай брыгады гэтага калгаса.

ВАЙЦЯНКОЎ Рыгор Максімавіч [н. 18.11(1.12).1900, в. Лужок Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з арганізатараў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1925. У 1919—24 у Чырв. Арміі. Удзельнік баёў супраць Юдзеніча. Пасля сканчэння Мінскай вышэйшай камуніст. с.-г. школы (1935) на парт. рабоце. З лют. 1942 камандзір дыверсійнай групы ў Полацкім р-не Віцебскай вобл. З сак. 1943 сакратар Асіповіцкага падпольнага РК КП(б)Б Магілёўскай вобл., адначасова камісар групы партыз. атрадаў Асіповіцкага р-на. З кастр. 1944 на парт. рабоце ў Асіповічах, Магілёве, Жлобіне. У 1948—58 працаваў у друку. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Рагачове.

ВАЙЦЯХІ, вёска ў Белькаўскім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Пушкіна. За 39 *км* на ПнУ ад Паставаў, 227 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Полава. 161 ж., двароў 53 (1970). Пач. школа, клуб, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі нямфаш. захопнікі. Помнік на магіле сав. воінаў і партызанаў.

ВАЙЦЯХОЎСКІ Мікалай Калістратавіч [н. 20.2(5.3).1917, Петраград], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Напярэдадні вайны інжынер на горных работах Іртышскага дзяржбуда. З кастр. 1941 у тыле ворага. У лют. 1942 арганізаваў партыз. атрад у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. У чэрв. атрад аб'яднаўся з *партызанскай брыгадай Бойкі,* нач. штаба якой стаў В. З крас. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя Кастуся Каліноўскага* Беластоцкай вобл. Стварыў антыфаш. к-ты і групы. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Ленінградзе.

ВАЙШЭШЫКА (санскр. вішэша — асаблівы, адметны), сістэма старажытнаіндыйскай філасофіі, заснаваная ў 3 ст. да н. э.

Была цесна звязана з прыродазнаўчанавуковымі ўяўленнямі стараж. індыйцаў. Прызнавала вечныя, непадзельныя і нябачныя атамы, улучэннем якіх кіруе сусветная душа. Элементы матэрыялізму, атамізм В. адыгралі значную ролю ў развіцці філас. думкі не толькі Індыі, а і інш. краін стараж. свету.

ВАКАЛІЗ (ад лац. vocalis галосны), музычны бястэкставы твор для голасу, прызначаны садзейнічаць развіццю яго рухомасці, гібкасці, выразнасці. Ёсць В., якія маюць не тэхнічнае, а самастойнае маст. значэнне («Вакаліз» С. Рахманінава, 5 мелодый без слоў для голасу і фп. С. Пракоф'ева, канцэрты для голасу з арк. Р. Гліэра, Я. Глебава і інш.).

ВАКАЛІЗМ, сістэма галосных гукаў якой-небудзь мовы, іх асаблівасці і адносіны. Гл. *Галосныя гукі.*

ВАКАМЕРНАЯ ЗДЫМКА, спрошчаная тапаграфічная здымка мясцовасці з дапамогай візірнай лінейкі, компаса і планшэта. Адлегласць вымяраецца крокамі або на вока. Дакладна наносяцца арыенціры, характэрныя няроўнасці рэльефу абазначаюцца ўмоўнымі гарызанталямі. В. з. карыстаюцца, каб хутчэй скласці прыблізны план мясцовасці пры геагр. ці геал. абследаваннях неабжытых раёнаў, адшуканні трас і ў вайсковай разведцы.

ВАКЗАЛ [ад англ. Vauxhall назва забаўнага (пацешнага) саду каля Лондана; у рус., а потым і ў бел. мове слова «В.» стала намінальным, магчыма, ад назвы Паўлаўскага В. (каля Пецярбурга), які быў адначасова чыг. станцыяй і забаўным месцам], будынак, прызначаны для абслугоўвання пасажыраў. Бываюць чыгуначныя, рачныя, марскія, аўта- і аэравакзалы.

ВАКСМАН Ісак Фёдаравіч (25.7.1922, мяст. Краснаполле Чэрыкаўскага пав. Гомельскай губ.— 18.12.1943), Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. Вучыўся ў Днепрапятроўскім трансп. ін-це (1938—40). Працаваў настаўнікам у школе. У Чырв. Арміі з ліп. 1941, на фронце з кастр. 1942. Удзельнік баёў пад Сталінградам, на Доне, Северскім Данцы, Дняпры. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Запарожжа і ў баях за плацдарм у ліст. 1943. Батарэя, якою камандаваў В., пад агнём ворага пераправілася цераз Дняпро, у баях за плацдарм знішчыла 15 варожых агнявых кропак, адбіла 10 контратак. Загінуў у баі.



ВАКУЛА Нэлі Андрэеўна (н. 25.8.1949, Гомель), майстар спорту СССР міжнар. класа па веславанні на байдарках. Чэмпіён СССР 1968 на байдарцы-адзіночцы ў эстафеце 4×500 *м.* Чэмпіён СССР і Еўропы 1969 (байдарка-двойка, 1000 *м*; байдарка-чацвёрка, 500 *м*). Інструктар фіз. культуры ў Гомельскім абласным ДСТ «Дынама».

ВАКУЛЬСКІ Аляксандр Васілевіч (н. 28.8.1922, с. Калтыманава Уфімскага кантона Башкірскай АССР), Герой Сав. Саюза (1945). Беларус. Чл. КПСС з 1945. У Чырв. Арміі з



крас. 1941, лётчык-штурмавік. Удзельнік баёў на Віцебска-Полацкім напрамку, вызваленні Літвы і Латвіі, разгрому кёнігсбергскай варожай групоўкі. Зрабіў 111 баявых вылетаў. Знішчыў 55 варожых аўтамашын, 9 гармат, 5 танкаў, 5 артыл. і мінамётных батарэй, 1 самалёт, 5 складаў з боепрыпасамі і гаручым, заглушыў агонь 12 батарэй зенітнай артылерыі. У 1946—62 у грамадз. авіяцыі, налятаў 3,5 млн. *км*. Жыве ў Ізмаіле.

ВАКУУМ (лац. vacuum пустата), стан газу пры цісках, значна меншых за атмасферны. Паняцце В. ужываецца толькі для газу, змешчанага ў сасуд. Паводзіны газу ў В. вызначаюцца адносінамі *даўжыні свабоднага прабегу* малекул (λ) да пэўнага памеру прылады d (напр., да адлегласці паміж сценкамі сасуда, паміж электродамі ў трубцы і інш.). Адрозніваюць В. нізкі, сярэдні і высокі. У звычайных вакуумных установоўках (d каля 0,1 *м*) В. лічыцца нізкім пры λ намнога меншым за d (ціск ад атмасфернага да 1 *мм рт. сл.*), сярэднім — пры λ прыблізна роўным d (ціск ад 1 да 10^{-3} *мм рт. сл.*), высокім — пры λ намнога большым за d (ціск ад 10^{-3} да 10^{-8} *мм рт. сл.*). Пры меншых цісках В. наз. звышвысокім. Самы высокі дасягнуты В. (1969) адпавядае ціскам 10^{-15}—10^{-16} *мм рт. сл.* Пры гэтым у 1 $см^3$ астаецца ўсяго некалькі дзесяткаў малекул (пры звычайных умовах у 1 $см^3$ іх 10^{19}).

Уласцівасці газу ў нізкім В. вызначаюцца частымі сутыкненнямі паміж малекуламі газу, якія суправаджаюцца абменам энергіяй. Таму цячэнне газу пры нізкім В. вязкаснае, а з'явы пераносу характарызуюцца плаўнай зменай градыента велічыні, якая пераносіцца. Напр., т-ра газу паміж гарачай і халоднай сценкамі сасуда мяняецца паступова, а колькасць перанесенай цеплыні, імпульсу і інш. не залежыць ад ціску. Гал. роля ў праходжанні току праз нізкі В. належыць іанізацыі малекул газу. У высокім В. ўласцівасці газу вызначаюцца сутыкненнямі яго малекул са сценкамі сасуда (сутыкненні паміж малекуламі газу адбываюцца рэдка і адыгрываюць нязначную ролю). Рух малекул паміж сценкамі ў высокім В. прамалінейны (малекулярны характар цячэння), а з'явы пераносу характарызуюцца наяўнасцю скачка, напр., т-ра газу ў сасудзе ўсюды аднолькавая, але адрозніваецца ад т-ры і халодай і гарачай яго сценак. Колькасць перанесенай цеплыні, электрычнасці і інш. прама прапарцыянальная ціску газу. Ток праз высокі В. праходзіць толькі пры наяўнасці эмісіі электронаў і іонаў электродамі (гл. *Электронная эмісія*). Уласцівасці газу ў сярэднім В. праменкавыя паміж яго ўласцівасцямі ў нізкім і высокім В. Звышвысокі В. звязаны не адносінамі λ/d, а з паводзінамі ў В. паверхняў цвёрдых цел. На паверхні любога цела заўсёды ёсць тонкі слой газу, пазбавіцца ад якога можна награваннем паверхні. Пры гэтым паверхневыя ўласцівасці цел рэзка мяняюцца: павялічваецца каэфіцыент трэння, у шэрагу выпадкаў становіцца магчымай дыфузійная зварка матэрыялаў нават пры пакаёвых т-рах. Выдалены слой газу паступова аднаўляецца ў выніку адсорбцыі яго паверхняй, уласцівасці паверхні зноў мяняюцца. Звышвысокі В. вызначаецца як такі В., у якім за час назірання не адбываецца істотных змен уласцівасцей ачышчанай ад газу паверхні ў выніку ля ўзаемадзеяння з малекуламі газу.

Атрымліваюць В. з дапамогай вакуумных помпаў, вымяраюць вакуумметрамі. Гл. *Вакуумная тэхніка*.

А. М. Родзін. Масква.

ВАКУУМ (у квантавай тэорыі поля), асноўны, г. зн. энергетычна найніжэйшы стан поля ці сістэмы палёў, якія апісваюць адпаведныя *элементарныя часцінкі*. У гэтым сэнсе над В. разумеюць стан поля, які не змяшчае часцінак. Такое паняцце В. адрозніваецца ад уяўлення пра В. як разрэджаны стан газу. Асн. характарыстыка В.— здольнасць да «дэфармацыі» пад дзеяннем змешчанай у ім зараджанай часцінкі, т. зв. паляризацыя В. Паводле *квантавай тэорыі поля* ў В. магчыма ўтварэнне пар зараджаных часцінак (электрон-пазітронных, мезонных і г. д.) нават у выпадку, калі закон захавання энергіі-імпульсу забараняе рэальнае ажыццяўленне гэтых працэсаў. У выніку праспаравага перараз меркавання зарадаў у В. адбываецца памяншэнне выходнага заряду («экранаванне»).

Паляризацыя В. колькасна вывучаецца ў *квантавай электрадынаміцы*. Зарад электрона, акружанага воблакам пар, успрымаецца ў фіз. эксперыментах як эфектыўны зарад, размеркаваны ў сферы з радыусам парадку $\frac{\hbar}{m_e c} \approx 4 \cdot 10^{-13}$ *м*, дзе $\hbar$ — *Планка пастаянная*, падзеленая на 2π, c — скорасць святла, m_e — маса электрона. Удакладнены ў сувязі з эфектам паляризацыі В. патэнцыял зарада роўны $\varphi(r) = \frac{e(r)}{4\pi\varepsilon_0 r}$, дзе r — адлегласць ад крыніцы поля, $e(r)$ — выходны эфектыўны зарад электрона, ε_0 — эл. пастаянная ў сістэме CI. Для вялікіх адлегласцей $r > \frac{\hbar}{m_e c}$ ён супадае з эксперыментальна вызначаным зарадам e электрона, а для $r < \frac{\hbar}{m_e c}$ роўны $e(r) \approx e\left[1 + \frac{e^2}{6\pi^2} \ln \frac{\hbar}{cm_e r}\right]$. Паляризацыя В. выклікае некат. фіз. працэсы (рассеянне святла на святле, рассеянне святла статычным эл. полем, врух энергетычных узроўняў атамных электронаў і інш.), якія прыводзяць да малых паправак у значэнні фіз. велічынь, якія назіраюцца. Разлічаныя ў квантавай электрадынаміцы фіз. працэсы, у якіх неабходна ўлічваць паляризацыю В., з высокай дакладнасцю пацверджаны эксперыментальна.

Літ.: Ахиезер А. И. и Берестецкий В. Б. Квантовая электродинамика, 2 изд., М., 1959; Комаров Л. И., Романова Т. С. и Федоров Ф. И. О поляризации вакуума в квантовой электродинамике. «Весці АН БССР. Сер. фіз.-матэм. навук», 1967, № 1; Швебер С. Введение в релятивистскую квантовую теорию поля, [пер. с англ.], М., 1963.

Т. С. Раманава. Мінск.

ВАКУУМНАЯ ТЭХНІКА, 1) машыны, прыстасаванні і прылады, якія ствараюць, падтрымліваюць і вымяраюць *вакуум*. Да іх адносяцца: вакуумныя помпы, вентылі, клапаны, вакуумметры.

Вакуумныя помпы выдаляюць газы і пару з закрытага аб'ёму. Яны падзяляюцца на поршневыя, ротарныя, струменныя, малекулярныя, ртутна-дыфузійныя і інш. Поршневыя вакуумныя помпы — шматступеньчатыя, з залатніковым газаразмеркаваннем. Прынцып дзеяння — усмоктванне і выштурхванне газу зваротнапаступальным ходам поршня. Высокапрадукцыйныя, скорасць адпампоўвання ад 0,75 да 250 $м^3/мін$. Забяспечваюць вакуум $75 \div 0{,}5$ *мм рт. сл.* Ротарныя помпы маюць кола з лапаткамі, устаноўленае ў корпусе эксцэнтрычна. Корпус запоўнены вадкасцю (вада, масла). Пры вярчэнні ротара аб'ём паміж лапаткамі спачатку павялічваецца і ўтвараецца вобласць нізкага ціску. Газ усмоктваецца. Потым аб'ём памяншаецца, і газ выштурхваецца ў атмасферу. Помпы гэтага тыпу наз. форвакуумнымі, а з 2 ротарамі — бустэрнымі. Ствараюць вакуум да 10^{-2} *мм рт. сл.* пры скорасці адпампоўвання $3 \div 75$ $м^3/мін$. Струменная помпа ўсмоктвае газ і пару за кошт кінетычнай энергіі струменю інш. вадкасці, пары або газу. Дае вакуум да 10^{-6} *мм рт. сл.* Малекулярная вакуумная помпа мае барабан, які круціцца са скорасцю да 5000 *аб/мін*. Па вінтавой канаўцы на барабане малекулы газу, які ўсмоктваецца, перамяшчаюцца да выхаднога патрубка. Забяспечвае вакуум да 10^{-8} *мм рт. сл.* Ртутна-дыфузійная помпа працуе па прынцыпе ўзаемнай дыфузіі газу і пары ртуці. Стварае вакуум $10^{-6} \div 10^{-7}$ *мм рт. сл.* Вакуумны вентыль — разнавіднасць клапана. Ставіцца на вакуумправодзе папярэдняга разрэджвання. Вакуумны клапан — прыстасаванне для рэгулявання расходу газу пры стварэнні вакууму ці адключэнні вакуумнага аб'ёму ад атмасферы. Вакуумметр — прылада, якою вымяраюць разрэджванне газаў ад 760 да 10^{-7} *мм рт. сл.* Вадкасныя складаюцца з дзвюх шкляных трубак, напоўненых ртуццю і злучаных паміж сабой, а таксама з вакуумным аб'ёмам і атмасферай. Розніцы вышыні слупкоў ртуці служыць мерай вакууму. Спружынныя вакуумметры маюць трубку-спіраль або мембранную каробку. Змена велічыні вакууму дэфармуе гэтыя датчыкі, што адзначаецца стрэлкай. Іанізацыйныя вакуумметры вымяраюць ток іанізацыі, які залежыць ад ступені вакууму. Для атрымання і вымярэння вакууму вакуумныя помпы, вентылі, клапаны і вакуумметры злучаюцца трубаправодам у сістэму (гл. рыс.).




Схема вакуумавання: *1*—камера; *2* — вакуумметр; *3* — затвор; *4* — трубаправод; *5* — вентыль; *6* — форвакуумная помпа; *7* — бустэрпомпа; *8* — высокавакуумная помпа.

2) Апараты, якія выкарыстоўваюць вакуум для ажыццяўлення фіз. ці тэхналаг. працэсаў або для выпрабавання аб'ектаў на шчыльнасць. Да іх адносяцца: вакуумныя камеры *паскаральнікаў зараджаных часцінак* і камеры выпрабавання касм. лятальных апаратаў; фільтры, сушылкі, прэсы, крышталізатары; установкі вакуумавання бетону, расплаву металаў і г. д.

Літ.: Королев В. И. Основы вакуумной техники, 5 изд., М.— Л., 1964; Пипко А. И., Плисковский В. Я. и Пенчко Е. А. Оборудование для откачки вакуумных приборов, М.— Л., 1965; Вакуумные системы и их элементы. Справочник-атлас, под ред. В. Д. Дубенца, М., 1968.

Ю. А. Волкаў. Мінск.

ВАКХ, гл. *Дыяніс*.

ВАКХАНАЛІІ (лац. Bacchanalia), рэлігійныя святкаванні ў гонар Вакха, бога ўрадлівасці, вінаградарства і вінаробства ў Старажытным Рыме. Спачатку былі земляробчымі святамі (у Ст. Рыме ліберапіі; у Ст. Грэцыі дыянісіі, святы ў гонар *Дыяніса*). Пазней атрымалі характар оргій. У 186 да н. э. рымскі сенат забараніў В.

ВАКЦЫНЫ, прэпараты для актыўнай імунізацыі людзей і жывёл з мэтай папярэджання (радзей лячыць) інфекцыйных хвароб. Ужываюць В. з аслабленых і нежывых мікробаў, рэчываў іх жыццядзейнасці або састаўных частак бактэрыйных клетак. Выпускаюць у выглядзе сухіх і вадкіх прэпаратаў супраць адной, адначасова двюх, трох і больш інфекцыйных хвароб. Уводзяць В. (вакцынацыя, імунізацыя, прышчэпкі) праз рот, дыхальныя шляхі, на скуру, пад скуру, у мышцы і інш. *Імунітэт* бывае ад аднаго да некалькіх гадоў. Каб яго падоўжыць, В. ўводзяць паўторна (рэвакцынацыя). У СССР В. вырабляюць навукова-вытворчыя ўстановы.

3.6.1919 на Беларусі па прапанове У. І. Леніна прыняты дэкрэт пра абавязковую вакцынацыю супраць *воспы*. Прадугледжана абавязковая вакцынацыя супраць *слупняку, туберкулёзу, поліяміэліту, коклюшу, дыфтэрыі*. Пры рэальнай пагрозе заражэння робяць прышчэпкі ад *шаленства, чумы, брушнога тыфу* і інш. хвароб. У вет. практыцы карыстаюцца вакцынамі супраць сібірскай язвы, паратыфу ў свіней, чумы птушак. Проціпаказана ўжываць В. пры вострых і хранічных запаленнях, зменах рэактыўнасці арганізма.

Бел. вучонаму Б. Я. *Эльберту* і праф. М. А. Гайскаму прысуджана Дзярж. прэмія СССР за распрацоўку тулярэмійнай вакцыны (1941—45). В. І. *Вацякой*, Э. У. Фельдман і І. Б. Кардаш і інш. паказалі (1959—61) высокую эпідэміялагічную эфектыўнасць прышчэпак супраць поліяміэліту жывой вакцынай. Бел. НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі выпускае воспавую вакцыну. Ужыванне В. і комплекс сан.-гігіенічных мерапрыемстваў у БССР ліквідавалі натуральную воспу і ввялі да адзінкавых выпадкаў поліяміэліт, дыфтэрыю і некат. інш. хваробы.

Літ.: Практическая иммунология, М., 1969; Иммунологические исследования в диагностике и профилактике инфекционных заболеваний, Мн., 1968.

А. В. Давыдаў. Мінск.

ВАЛ, 1) у машынабудаванні — асноўная дэталь машыны ці механізма для перадачы вярчальных намаганняў.

Размяшчаюцца В. на дзвюх і больш апорах. Паводле прызначэння і ўмоў работы адрозніваюць карэнныя, якія перадаюць і ўспрымаюць работу рухавіка (могуць быць прамыя, крывашыпныя і каленчатыя); перадатачныя (адначасова з'яўляюцца вядзёнымі і вядучымі); трансмісійныя (перадаюць вярчальныя намаганні ад рухавіка рабочым органам машыны); контрпрыводныя (мяняюць колькасць абаротаў вядзёных В.). Паводле канструкцыі падзяляюцца на гладкія (увесь В. мае сячэнне аднолькавай формы і памеру); фасонныя з розным папярочным сячэннем, у т. л. размеркавальныя, карданныя і інш.; фланцавыя; гнуткія, якія перадаюць вярчальныя намаганні пад рознымі вуглами. В. бываюць суцэльныя і пустацелыя (аблегчаныя).

2) У будаўніцтве — архітэктурны аблом з папярочным паўкруглым разрэзам. 3) У ваеннай справе — земляны насып вакол старадаўняга паселішча ці крэпасці. Складаўся з брустверa і валгангa (пляцоўка з уступамі). 4) У геаграфіі — форма рэльефу ў выглядзе падоўжнага насыпу і форма вадзяной, пераважна марской, хвалі. 5) У электратэхніцы — схемы шматрухавіковага эл. прывода для забеспячэння сінхроннага вярчэння эл. рухавікоў, якія працуюць у адным агрэгаце, але не звязаны механічна (не маюць агульнага В.).

ВАЛ ТЭКТАНІЧНЫ, выцягнутая пакатая антыклінальная складка ў асадкавых пародах платформавага чахла. Даўжыня да некалькіх соцень кіламетраў, шырыня некалькі дзесяткаў кіламетраў. Утвараюцца пераважна над разрыўнымі парушэннямі крышталічнага фундаменту ў выніку дыферэнцыраваных рухаў яго асобных блокаў і дэфармацыі больш пластычных пород асадкавага чахла. Напр., Рэчыцкі і інш. тэктанічныя валы ў Прыпяцкай упадзіне, Дона-Мядзведзіцкі на Пд, Вяцкі і Окска-Цнінскі на У Усх.-Еўрап. платформы.


ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ, статыстычны паказчык выражанай у грашовым вылічэнні прадукцыі прадпрыемстваў, галін і ўсёй народнай гаспадаркі. Вызначаецца ў прамысл., с. гасп., буд-ве, на транспарце, у гандлі, мат.-тэхн. забеспячэнні і выкарыстоўваецца для вызначэння фізічнага аб'ёму, дынамікі і тэмпаў агульнага росту ўсёй вытворчасці і асобных яе галін, выяўлення прапорцый паміж гэтымі галінамі, для ўліку і планавання патрэбнай колькасці рабочых, сыравіны, матэрыялаў, паліва, а таксама фондаў заработнай платы, прадукцыйнасці працы і фондааддачы.

В. п. прамысловасці — сукупнасць валавой прадукцыі ўсіх прамысл. прадпрыемстваў за пэўны перыяд. Апрача чыстай прадукцыі, уключае атрыманую прадпрыемствам і спажытую ў вытв. працэсе вартасць сыравіны, матэрыялаў, паліва, эл. энергіі, а таксама амартызацыю асн. сродкаў. В. п. прадпрыемства пераважна вызначаецца заводскім спосабам: з усяго валавога абароту вылічаецца ўнутрызаводскі абарот (прадукцыя некат. цэхаў, выкарыстаная для вырабу канчатковай прадукцыі ў інш. цэхах). Ацэньваецца ў аптовых цэнах. Для параўнання паказчыкаў за розныя перыяды В. п. прамысловасці вызначаецца ў супастаўных цэнах, уведзеных 1.7.1967. Пасля эканам. рэформы 1965 В. п. не даводзіцца прадпрыемствам у якасці планавага паказчыка і не выкарыстоўваецца для ацэнкі іх вытворчай дзейнасці.

В. п. сельскай гаспадаркі — выражаная ў грашовым вылічэнні прадукцыя с. гасп. Уключае таксама кошт сродкаў, выкарыстаных у працэсе с.-г. вытворчасці (насенне, карма, амартызацыя будынкаў, машын і г. д.). У СССР вызначаецца ў цэлым па краіне і асобна па калгасах, саўгасах і асабістых падсобных гаспадарках. Вымяраецца ў супастаўных цэнах 1965.

У БССР з 1940 да 1969 В. п. прамысловасці павялічылася амаль у 11 разоў, В. п. с. гасп. ў 1,7 раза. *В. С. Майрышчаў, П. М. Цыбулька.* Мінск.

ВАЛАВОКА (Troglodytes troglodytes), птушка атр. вераб'іных. Адна з самых маленькіх на Беларусі птушак (пар. назвы: валовае вока, блыха, блышка). Даўж. да 12 *см*. Маса каля 10 *г*. Апярэнне шаравата-бураватае з рабацінкамі. Хвосцік кароткі, тарчма. Пашырана ў Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы і Паўн. Амерыцы. Непаседлівая, вёрткая, піе надзвычай меладычна. Селіцца ў мяшаных і лісцевых лясах. Шарападобныя гнёзды робіць у зарасніку, сярод буралому. Двойчы за лета нясе па 4—7 белых з буравата-чырванаватымі крапінкамі яец. Наседжвае 13—16 дзён. Корміцца дробнымі насякомымі, павукамі, часткова ягадамі і насеннем раслін. Карысная для лясной гасп.



Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

Р. К. Кажэўнікава. Мінск.

ВАЛАВЫ АБАРОТ прамысловага прадпрыемства, сумарны кошт адпушчанай заказчыку і выкарыстанай унутры прадпрыемства прадукцыі ўсіх вытворчых падраздзяленняў. Перавышае кошт *валавой прадукцыі* прадпрыемства на велічыню ўнутрызаводскага абароту, г. зн. на кошт вырабаў і паўфабрыкатаў, якія выкарыстаны ўнутры прадпрыемства (напр., ліццё, пакоўкі ліцейнага і кавальскага цэхаў, якія ўжыты ў мех. цэху).

Афіц. статыстыкай В. а. не ўлічваецца і ў цэлым па прамысловасці не вызначаецца. Ужываецца на прадпрыемствах і ў асобных галінах прамысловасці для ацэнкі выканання плана вытворчасці, а найчасцей пры значных зменах унутр. структуры прадпрыемства — пры падзеле яго на некалькі самастойных або аб'яднанні некалькіх прадпрыемстваў у адно.

ВАЛАВЫ ДАХОД, выражаная ў грашовым вылічэнні частка валавой прадукцыі, выключаючы матэрыяльныя затраты на яе вытворчасць. В. д. усёй нар. гасп. роўны *нацыянальнаму даходу*. За вылікам фонду аплаты працы В. д. утварае *чысты даход*.

ВАЛАГОДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 23.9.1937. Пл. 145,7 тыс. *км*². Нас. 1296 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 26 раёнаў; 15 гарадоў, 11 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Волагда.

Паверхня — хвалістая раўніна, парэзаная шырокімі далінамі шматлікіх рэк. На ПнЗ Вепсаўскае (выш. да 304 *м*) і Андомскае (выш. да 293 *м*) узвышшы, Мягорская града (выш. да 252 *м*). На ПдЗ Андогская града выш. да 299 *м*. На ПдУ адгор'і Паўн. Увалаў выш. да 293 *м*. Карысныя выкапні: торф, буры жалязняк, вогнетравалыя гліны, кварцавы пясок, спажыўная соль. Есць мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад —11 да —14, ліп. 17; 18 °С. Ападкаў 550—600 *мм* за год. Рэкі: Сухана, Юг, Вага, Шэкснa, Унжа; усе маюць многа прытокаў. На тэр. вобласці праходзіць Волга-Балтыйскі водны шлях імя У. І. Леніна і Паўночна-Дзвінскі канал. Азёры: Анежскае, Белае, Вожэ, Кожскае, Кубенскае. На ПдЗ Рыбінскае вадасх. Глебы дзярнова-падзолістыя, балотныя і алювіяльныя, ёсць перагнойна-карбанатныя. Пад лесам 68% тэр. Пераважаюць хвойныя пароды. Больш за 15% тэр. займаюць лугі і паша, каля 10% балоты. На тэр. В. в. палова Дарвінскага запаведніка. Асн. насельніцтва рускія. Сярэдняя шчыльн. 8,9 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 48% (1970). Найб. гарады: Чарапавец (189 тыс. ж.), Волагда (178 тыс. ж., 1970), Сокал, Вялікі Усцюг.

Аб'ём валавой прадукцыі прамысл. павялічыўся ў 1968 у параўнанні з 1940 у 8,6 раза. Гал. галіны прамысл.— чорная металургія, лесанарыхтоўчая, лесаапрацоўчая, папяровая. Нарыхтоўкі драўніны ў Выцегарскім, Харайскім, Вялікаусцюгскім, Кічменгска-Гарадоцкім р-нах. Цэнтры лесапілавання Сокал і Харайск. Цэлюлозна-папяровая прамысл. (2 камбінаты ў Сокале, папяровая ф-ка ў Чарапавецкім р-не). Вытв. фанеры ў Вялікаусцюгскім р-не і ў Чарапаўцы, мэблі ў Волагдзе і Чарапаўцы, драўніннавалакністых пліт у Сокале, драўніннастружкавых пліт у Чарапаўцы, фібралітавых пліт у гарадскіх пасёлках Суда, Вохтага, імя Жалябава, а таксама ў Харайску і Сокале. Лесахімія (спіртавыя з-ды ў


ВАЛАГОДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Маштаб 1:7 000 000
0 70 140 км
1. Калінінская вобл., 2. Кіраўская вобл.,
3. Нефтагорская вобл., 4. Ярасла́ўская вобл.
Валагодская вобл.
Сокал
Чарапавец
Волагда
Вялікі Усцюг
Кадніка
Шуйскае
Салігалічскае
Кубенскае
Вожэ
Вага
Сухана
Юг
Шэкснa
Унжа
Рыбінскае вадасх.
Белае
Кубенскае
Анежскае
Кірыллаў
Харайск
Тотьма
Грязавец
Вохтага
Вялікаусцюгскі
Кічменгска-Гарадоцкі
Сямжа
Нікольск
Бабушкіна
Раслацкае
Кадгора
Чулкова
Вохма
Пашазёрскае
Вялікарэчанскае
Шэкснa
Суда
Жалябава
Весягонск
Устюжна
Хвойна
Вастова
Шальдзіха
Шэкснa
Шэкснa
Шэкснa

ВАЛАДЗЬКО Леанід Вікенцьевіч (н. 2.1.1928, в. Баравое Койданаўскага р-на Мінскай акр.), беларускі савецкі фізік. Чл.-кар. АН БССР (1969), д-р фіз.-матэм. н. (1966), праф. (1967). Чл. КПСС з 1959. З сялян. Скончыў БДУ ў 1953, дзе і працуе з 1956. У 1963—66 заг. кафедры спектральнага аналізу, з 1966 прарэктар па навук. рабоце. Асн. кірункі даследаванняў — малекулярная спектраскапія і люмінесцэнцыя. Навук. працы па вывучэнні спектраў люмінесцэнцыі уранілавых злучэнняў. Высветліў сувязь паміж спектральна-люмінесцэнтнымі ўласцівасцямі гэтых злучэнняў і іх структурай і будовай электрон. абалонкі малекул.



Тв.: (У саўт.) Природа спектров люминесценции ураниловых соединений, «Вестник БГУ. Сер. 1», 1969, № 1; (у саўт.) Систематика спектров поглощения и электронных состояний в ураниловых соединениях, там жа, 1969, № 3.

ВАЛАДЗЬКО Міхаіл Мікітавіч [н. 26.10(8.11).1904, в. Паморшчына Мінскага пав.], гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1939. Удзельнік грамадз. і Айч. вайны. У 1929—41 на кіруючай гасп. і сав. рабоце ў Мінскім р-не. У 1946—61 старшыня калгаса імя Гастэлы, у 1962—65 старшыня калгаса імя Заслонава Мінскага р-на. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў в. Капіевічы Мінскага р-на.

ВАЛАДКЕВІЧ Лізавета Трафімаўна (н. 28.7.1924, в. Лоск Ашмянскага пав. Віленскага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). З 1949 працуе ў калгасе імя Чапаева Валожынскага р-на Мінскай вобл. З 1958 звяніявая па вырошчванні лёну.

ВАЛАКАРДЗІН, лякарства, аналаг сав. прэпарата карвалолу. Бясколерная празрыстая вадкасць. Умацоўвае мускулатуру сэрца, здымае сутаргі, супакойвае цэнтр. нервовую сістэму, расшырае сасуды. Ужываецца ўнутр у кроплях пры стэнакардыі, неўрозах, тахікардыі, бяссонніцы. Пабочных з'яў не выклікае. Выпускаецца ў ГДР.


ВАЛАКНІСТЫЯ РАСЛІНЫ, група раслін, валокны якіх ідуць на розныя вырабы (пражу, тканіны, вяроўкі, канаты, рыбалоўныя снасці і інш.). Есць сярод водарасцей, грыбоў, лішайнікаў, мохападобных, папарацепадобных, голанасенных і асабліва сярод пакрытанасенных. Усяго каля 2000 відаў, выкарыстоўваецца каля 600.

Найб. важныя сямействы: мальвавых (бавоўнік, кенаф, канатнік); лёнавых (лён, драцэна); ліпавых (джут, ліпа); каноплевых (каноплі); крапіўных (рамі, крапіва); матыльковых (краталярыя); кендыр); агававых (агава); бананавых (банан). Як валакністы матэрыял выкарыстоўваюцца лубяныя, драўняныя (лібрыформ) валокны і валаскі (вырасты клетак эпідэрмісу) раслін. В. р. падзяляюцца на: 1) з сапраўднымі валаскамі (яны акружаюць семя — бавоўнік або ўкрываюць яго — капок ці ўтвараюць на ім чубок); 2) з лубянымі валокнамі. Да другой групы належыць большасць В. р. У залежнасці ад месца лубяных валокнаў у органах раслін адрозніваюць: лісцевыя (валокны ў лісці) — новазеландскі лён, маніла, калам, агава, тэкст. банан, рафія і інш.; сцябловыя (валокны ў сцяблах) — *лён, каноплі*, кенаф, крапіва, рамі, канатнік, джут, кендыр, сіда, сан, краталярыя і інш.

У СССР культывуюцца бавоўнік, лён, каноплі, джут, кенаф; у БССР пашыраны лён і каноплі. Па зборы бавоўны СССР займае 2-е месца ў свеце; па вытворчасці валакна лёну, канапель і ўраджайнасці гэтых культур — 1-е. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Тэхнічныя культуры*.

Літ.: Некрасова В. Л. Волокнистые растения СССР, у кн.: Растительное сырье СССР, т. 1, М.— Л., 1950. *Б. М. Прусакова.* Мінск.

ВАЛАКУША, 1) старадаўняя прылада для рыхлення глебы; інш. назвы вяршаліна, сукаватка. У верхавіне моцнага дрэва сукі падсякаліся да пэўнай даўжыні і служылі зубамі. Апрацоўвалі В. зямлю з-пад лесу, на ляхах, дзе з-за мноства пнёў і карэння цяжка пускаць саху ці плуг. У В. запрагалі каня ці вала. 2) Навяснае прыстасаванне да трактара, якое збірае сена ці салому з валкоў у копы і перавозіць іх да месца сціртавання. Грабельны апарат В. складаецца з рашотак. Рысорнае прыстасаванне дае магчымасць пярэднім зубам незалежна адзін ад аднаго капіраваць няроўнасці поля, калі В. рухаецца з апушчанай рашоткай. Падымаецца і апускаецца грабельная рашотка ад гідрасістэмы трактара. В. збірае за 1 *гадз* сена ці салому з 1—3 *га*. Грузападымальнасць да 400 *кг*. 3) Прылада для веснавой апрацоўкі зяблёва. Складаецца з драўляных або метал. брусоў, злучаных ланцугом, і бруса-грабляў. Выраўноўвае грабяні і разбівае камякі глебы. 4) Бясколавая павозка ў жыхароў паўн. мясцін Расіі і Амерыкі. 5) У дарэвалюц. Расіі драўляная скрыня на палазах (сані), на якіх рабочы-саначнік перавозіў кам. вугаль з забою шахты. 6) Невялікі невад.



Літ.: Воронов Ю. И., Ковалев Л. П. и Устинов А. Н. Сельскохозяйственные машины, 2 изд., М., 1968.

ВАЛАНЖБІНСКІ ВЕК (ЯРУС) (ад назвы замка Валанжэн у Швейцарыі), ранні век раннемелавой эпохі *мелавога перыяду* (першы знізу ярус ніжнемелавога аддзела мелавой сістэмы). Вылучаны Э. Дэзорам у 1853. Адклады В. я. пашыраны ў Еўрапейскай ч. СССР, дзе яны месцамі ўтвараюць верхнюю прадукцыйную зону буйных радовішчаў фасфарытаў, у Сібіры, Крымска-Каўказскай вобл. На Беларусі адклады В. я. трапляюцца толькі на ПдУ. Складзены з тоўшчы (да 17 *м*) пясчана-гліністых парод.

ВАЛАПАС (лац. Bootes), сузор'е паўн. паўшар'я неба. Найбольш яркая зорка — Арктур (α Валапаса) 0-й зорнай велічыні; ёсць падвойныя зоркі. На тэр. БССР відаць зімою, вясной і летам. Гл. *Зорнае неба*.

ВАЛАСАЕДЫ (Trichodectidae), сям. паразітычных насякомых атр. *пухаедаў*. Цела плоскае, шчаціністае (даўж. 0,8—10 *мм*), без крыльцаў. Галава шырокая. Ротавыя органы грызучыя. Вядома больш за 50 відаў. Жывуць на поўсці жывёл, кормяцца арагавелымі часцінкамі скуры, валасамі і крывёю гаспадара. Паразітуюць амаль на ўсіх с.-г. і прамысл. жывёлах. Скуру заражанай жывёлы апрацоўваюць інсектыцыдамі.

Літ.: Жизнь животных, т. 3, М., 1969.

ВАЛАСАТАЎ Віктар Аляксандравіч (н. 28.9.1925, г. Архангельск), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з студз. 1943. Вызначыўся 15.7.1944 каля в. Каўшы Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. З узводам разведчыкаў фарсіраваў Нёман, утрымліваў плацдарм да пераправы ўсяго палка і паранены не пакінуў поля бою. Жыве ў Шэнкурскім р-не Архангельскай вобл.

ВАЛАСАТЫ НАСАРОГ (Rhinoceros antiquitatis), вымерлая млекакормячая жывёла атр. няпарнакапытных.

Нагадваў сучасных насарогаў, але меў цела, укрытае густой поўсцю. Выш. каля 2 *м*, чэрап доўгі з двума рагамі. Жыў у ледавіковы перыяд. Шмат яго рэштак знаходзяць у Еўропе і Паўн. Афрыцы. Ва Усх. Сібіры ў воне вечнай мерзлаты траплялася трупы В. н. з уцалелай поўсцю. Увахо-дзіць у склад верхнепалеалітычнага (мамантавага) фаўністычнага комплексу, які мае значэнне для стратыграфічнага расчлянення сярэдне- і верхнеплейстацэнавых адкладаў.

ВАЛАСЕВІЧ Эдуард Станіслававіч (н. 12.3.1918, Магілёў), беларускі савецкі паэт-байкапісец. Чл. КПСС з 1949. З рабочых. У 1941 скончыў Магілёўскі пед. ін-т. Удзельнік Айч. вайны. Друкуецца з 1938. Выдаў зб.: «Вершы і байкі» (1954), «Залатая рыбка» (1957), «Як дбаеш — так і маеш» (1958), «Арліны суд» (1959), «Соль» (1962). Лепшыя байкі В. вызначаюцца актуальнасцю тэматыкі, камізмам сітуацый, дасціпным нар. гумарам. Піша вершы і байкі для дзяцей (зб. «Камар-званар», 1959; «Горкі мёд», 1967), аднаактовыя камедыі і скетчы (зб. «Свет клінам не сышоўся», 1958; «З хворай галавы на здаровую», 1961), эпіграмы і пародыі.

Тв.: Байкі, Мн., 1960; Казёл адпушчэння, Мн., 1968.

Літ.: Казека Я. Беларуская байка, Мн., 1960.


ВАЛАСНІ (Nematomorpha, Gordiacea), клас круглых чарвей. Цела воласападобнае, укрыта кутыкулай (тонкай праврыстай плёўкай), ад жоўтага да цёмна-карычневага і амаль чорнага колеру. Даўж. да 1,5 *м*, дыяметр каля 0,5—2 *мм* (нар. назва жывы волас). Вядома каля 100 відаў, аб'яднаных у 12 родаў. Раздзельнаполыя. Дарослыя В. жывуць свабодна ў вадзе, часам збіраюцца ў клубкі. Лічынкі паразітуюць у целе водных беспазваночных (насякомых, малюскаў), у цыкле развіцця зменьваюць 2 гаспадароў. Знішчаюць шкодных насякомых. Чалавеку і пазваночным жывёлам не шкодзяць.

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

ВАЛАСНЫ СУД, ніжэйшы саслоўны сялянскі суд у царскай Расіі, які разглядаў на аснове мясцовых звычаяў менш важныя, але пашыраныя сярод сялян грамадзянскія і крымінальныя справы. Засн. ў 1861. У 1889 прыняты правілы, якія паставілі В. с. у поўную залежнасць ад мясцовай адміністрацыі і дазволілі больш шырока ўжываць цялесныя пакаранні. В. с. былі сродкам класавай расправы з прац. сялянствам.

ВАЛАСОВА, вёска ў Ноўкінскім с/с Віцебскага р-на, на р. Лучосе. Цэнтр калгаса «Світанне». За 16 *км* на Пд ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Сасноўка. 209 ж., двароў 74 (1970). Клуб, б-ка, дзіцячы сад-яслі, магазін. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі спалілі амаль усю вёску. Помнік землякам, якія загінулі ў барацьбе з ням.-фаш. захопнікамі.

ВАЛАСОВІЧ Канстанцін Адамавіч [21.5(2.6).1869, в. Старчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 25.9.1919], прыродазнавец, геолаг, географ і хімік. Заснавальнік чацвярцічнай геалогіі і палеагеаграфіі ПнЗ Еўрап. Поўначы і Якуцкага Запаляр'я. Скончыў Варшаўскі ун-т. За ўдзел у рэвалюц. дзейнасці ў 1894 арыштаваны, сядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці і ў Варшаўскай цытадэлі, у 1896—99 у ссыльцы ў Архангельскай губ. Там вывучаў чацвярцічныя адклады на Паўн. Дзвіне, узначальваў дапаможную санную партыю Рус. палярнай экспедыцыі (1900—02) на Новасібірскія а-вы. У 1902—03 лячыўся ў Цюрыху (Швейцарыя), там прысутнічаў на сустрэчы (1902) з У. І. Леніным. У Расіі зноў арыштаваны. Пасля гібелі Э. В. Толя прадаўжальнік геал. работ Рус. палярнай экспедыцыі. Вывучаў постпліяценавыя адклады каля Петразаводска. У 1908—09 удзельнічаў у 2 геал.-геагр. экспедыцыях на Пн Якуціі. Даследаваў геалогію Хараўлахскіх гор і нізоўяў Лены. Збярог навуцы шкілет і рэштки Ляхаўскага маманта, унікальны экспанат Нац. музея гісторыі прыроды ў Парыжы. Удзельнічаў у інж.-геал. даследаваннях для рэканструкцыі Архангельскага марскога порта, працаваў над праблемамі чацвярцічнай геалогіі Паволжа і Кубані. Апублікаваны 16 прац. Яго імем названы мыс на паўн.-ўсх. узбярэжжы в-ва Бальшавік у архіпелазе Паўн. Зямля і выкапнёвыя расліны і жывёлы.



Тв.: Мамонт острова Большого Ляховского (Новосиб. острова), «Записки минералогического об-ва. Сер. 2», 1915, т. 50. *А. В. Мельнікаў.* Масква.

ВАЛАСОЎ ХВАРОБЫ, хваробы грыбковага паходжання і ад парушэнняў жыццёвых працэсаў у арганізме. Прыроджаныя ці набытыя. Грыбковыя В. х. (трыхамікозы): трыхафітыя, мікраспарыя, фавус.

Трыхафітыя (узбуджальнік трыхафітон) паражае скуру галавы, валасы і пазногці. Пачынаецца з белаватых плям з лусачкамі і чырванаватымі крапамі. Валасы робяцца крохкія, лёгка ломяцца каля асновы. На мікраспарыю (выклікае грыбок мікраспарон) хварэюць пераважна дзеці, ачагі паражэння падобныя да ачагоў трыхафітыі. Фавус — парша (узбуджальнік — ахарыён) бывае радзей, пашкоджвае валасы, скуру галавы і інш. частак цела. На скуры галавы з'яўляюцца саламяна-жоўтыя лусачкі. Непашкодж. валасы робяцца тонкія, сухія, нібы пасыпаныя попелам. Крыніцы заражэння трыхамікозамі — хворая жывёла (буйн. раг. жывёла, коні, сабакі, каты), рэчы хворага. Лячэнне: антыбіётык грызеафульвін; скуру галавы змазваюць ёднай настойкай або серна-дзягцярнымі мазямі. Прафілактыка: масавыя абследаванні насельніцтва ў ачагах захворвання; лячэнне грыбковых хвароб у жывёл. Неінфекцыйныя В. х.: валасатасць, выпадзенне валасоў. Валасатасць (гіпертрыхоз) абумоўліваецца хваробамі нервовай сістэмы і залоз унутранай сакрэцыі (лечнікаў, шчытападобнай залозы). Лечаць асн. хваробу, пры неабходнасці назначаюць гармональныя сродкі. Выпадзенне валасоў (пляшывасць, аблысенне) бывае пры парушэнні функцый сальных залоз (себарэя), пасля моцных нервовых узрушэнняў, інфекцыйных хвароб (тыф, грып), ад недастатковага або няправільнага догляду валасоў. Лячэнне: назначаюць заспакаяльныя сродкі, вітаміны, гармоны, бераксал, меладынін.

Літ.: Кашкин П. Н. Медицинская микология, Л., 1962; Богданович Л. И. Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967.

А. Я. Пракапчук, *В. Я. Корсун.* Мінск.

ВАЛАСОЎСКАЯ КУЛЬТУРА, неалітычная культура канца 3 — 1-й пал. 2-га тысячагоддзя да н. э. рыбалоўна-паляўнічых плямёнаў на Ніжняй Ацэ, Клязьме, Верхняй Волзе.

Назва паходзіць ад стаянкі каля с. Валасова недалёка ад г. Мурама. Ёй характэрны вялікія паселішчы з прамавугольнымі паўзямлянкамі, настайныя крамяніёвыя і каменныя прылады працы, таўстасценны посуд з круглым або плоскім дном з дамешкай тоўчаных ракавін, багата арнаментаваны рамчатым і грабеньчатым штампам, ямкамі і г. д. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Некат. вучоныя лічаць, што плямёны В. к.— продкі фіна-уграў.

ВАЛАСТАНІТ (ад прозвішча англ. хіміка У. Воластана), дашчаны шпат, мінерал, сілікат кальцыю $CaSiO_3$. Крышталі таблітчастыя трыклінай сістэмы, часцей радыяльна-прамяністыя, тычкаватыя і шкарлупінаватыя агрэгаты. Колер белы, ружаваты, буры; бляск шкляны. Цв. 4,5—5; шчыльн. 2800—2900 *кг/м*^{3}. Кантактавы мінерал метамарфічных і метасаматычных парод, багатых на кальцый.

ВАЛАСЫ, рагавыя ніткападобныя ўтварэнні скуры чалавека і млекакормячых жывёл. Укрываюць амаль усё цела. У млекакормячых з тоўстым эпідэрмісам (слоны, насарогі) або моцна развітым падскурна-тлушчавым слоем (кіты) валасяное покрыва рэдукаванае.

Волас складаецца са стрыжня (выступае над скурай), кораня, што размешчаны ў скуры і канчаецца цыбулінай. Апошняя мае камбіяльныя клеткі, пры размнажэнні якіх В. растуць.

На працягу жыцця арганізма В. аднаўляюцца (у чалавека без пэўнага рытму, у жывёл перыядычна — *лінька*). На жыццядзейнасць В. уплывае сімпатычная нервовая сістэма, гармоны гіпофіза, палавых залоз і кары надніракавік. В. засцерагаюць арганізм ад мех. пашкоджанняў, страты цяпла, выконваюць функцыю дотыку. В. жывёл (поўсць, пух) выкарыстоўваюцца ў нар. гаспадарцы. Пры інфекцыях і розных парушэннях у арганізме ўзнікаюць *валасоў хвароби*.


Літ.: Гистология, М., 1963.

С. А. Яроменка. Мінск.

ВАЛАСЫ ВЕРАНІКІ (лац. Coma Berenices), невялікае сузор'е паўн. паўшар'я неба. Яркіх зорак не мае. Простым вокам назіраецца зорнае скопішча, а магутныя тэлескопы выяўляюць пазагалактычныя туманнасці (галактыкі). У сузор'і В. В. размешчаны паўн. полюс Галактыкі. На тэр. БССР відаць зімой, вясной і летам. Гл. *Зорнае неба.*

ВАЛАСЮК Фёдар Канстанцінавіч (н. 6.1. 1921, Багуславічы Кобрынскага пав. Гродзенскай губ.), гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1951. Скончыў Гродзенскі с.-г. ін-т (1970). Удзельнік Айч. вайны. У 1944—58 у органах МУС БССР. З 1958 старшыня калгаса «XXI з'езд КПСС» Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.

ВАЛАСЯНКІ, валасянкавыя (Sylviidae), сям. птушак атр. вераб'іных. Даўж. 10,5—26 *см*, маса 6—30 *г*. Апярэнне буравата-шаравата-аліўкавае, часта са стракацінкамі, больш светлае на брушку. Дзюба тонкая, шылападобная. Вядома 386 відаў, пашыраных пераважна ва Усх. паўшар'і. У СССР 51 від з 13 родаў. У БССР 4 роды: *пеначкі, цвыркуны*, перасмешкі-мармытухі і ўласна валасянкі (асабліва пашыраны: В. шэрая, В. садовая, В. чорнагаловая). Добра адрозніваюцца адна ад адной характэрнымі песнямі. Жывуць у лясах і хмызняковых зарасніках. Гнёзды робяць на зямлі, на кустах і маладых дрэўцах. Нясуць 4—8 яец. Кормяцца пераважна насякомымі. Карысныя лясной і сельскай гаспадарцы.



Садовая валасянка.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ВАЛАТОЎКІ, старажытнарускія курганы, з якімі звязаны паданні пра *волатаў*, нібыта тут пахаваных. Такія міфалаг. ўяўленні былі пашыраны на Пн Беларусі і ў сумежных раёнах Пскоўшчыны, Смаленшчыны, Латвіі. Бурж. нацыяналісты спрабавалі скарыстаць паданні пра В. для абгрунтавання сваёй антынавуковай волатакрыўскай тэорыі паходжання беларусаў.

ВАЛАТОЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч (г. н. і см. невяд.), беларускі этнограф і краязнавец 2-й пал. 19 ст. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1875). Вывучаў на Палессі нар. вераванні і абрады беларусаў. Супрацоўнічаў у пецярбургскіх перыяд. выданнях «Русский мир», «Нива», дзе надрукаваны яго гал. працы «Нарысы Палесся» (1875), «Палескія святы» (1880), «Палеская паганшчына», «Палескія будні» (1881).

ВАЛАЎСК, вёска ў Ельскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Валаўск». За 35 *км* на ПдЗ ад Ельска, 223 *км* ад Гомеля, 25 *км* ад чыг. ст. Славечна, на шашы Лельчыцы — в. Скароднае. 902 ж., двароў 244 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі нямецка-фаш. захопнікі і загубілі больш за 50 яе жыхароў, на франтах вайны загінула 89 аднавяскоўцаў.

ВАЛАЎСКАЯ РУДНЯ, вёска ў Качышчанскім с/с Ельскага р-на Гомельскай вобл., на р. Батыўля. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 28 *км* на ПдЗ ад Ельска, 194 *км* ад Гомеля, 15 *км* ад чыг. ст. Славечна. 232 ж., двароў 77 (1970). Пач. школа, клуб, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі нямецка-фаш. захопнікі.

ВАЛАЎСКІ КАНАЛ, правы прыток р. Батыўлі (бас. Прыпяці). Даўж. 30 *км*. Цячэ ў Ельскім р-не Гомельскай вобл. Вадазбор (180 *км*^{2}) — плоская, слаба перасечаная і залесеная раўніна. Выкарыстоўваецца пры асушэнні балотаў.

ВАЛАЧОБНІКІ (валачэбнікі, лалоўнікі, кукобнікі, ралешнікі, хрыстоспікі), група вясковай моладзі, якая па старадаўнім звычаі хадзіла (валачылася) у час веснавых свят ад хаты да хаты і спявала пад вокнамі гаспадару і гаспадыні віншавальныя, велічальныя, т. зв. *валачобныя песні*. Хрысціянская царква імкнулася скарыстаць гэтыя звычаі і надаць ім рытуальны характар святкавання *вялікадня*. Сярод В. былі музыкі (скрыпачы, дудары), запявалы, або пачынальнікі, і збіральнікі гасцінцаў і пачастункаў. У сярэднія вякі валачобніцтвам займаліся і бел. скамарохі. У наш час валачобніцтва на Беларусі не бытуе.


ВАЛАЧОБНЫЯ ПЕСНІ, від народнай *каляндарна-абрадавай паэзіі*. Найбольш былі пашыраны ў беларусаў, часткова ў сербаў. Выконваліся на вялікдзень *валачобнікамі*. Вядомыя на Беларусі ў дзвюх разнавіднасцях: ранніх, язычніцкага паходжання, што маюць дачыненне да міфічных духаў — апекуноў поля і свойскай жывёлы; познія, у якіх пад уплывам хрысціянізацыі сталі выступаць бог і святыя. Паводле спосабу выканання, зместу і характару (заклінальнасць і велічанне) блізка стаяць да песень калядоўшчыкаў. У В. п.— услаўленне вясны, роднай зямлі, селяніна-хлебароба, яго гасп. працы, паэт. ідэалізацыя маёмаснага становішча. Бел. В. п. антымістычныя па змесце, мажорныя па меладыйна-ладавай структуры. Іх запісвалі П. Бяссонаў, І. Насовіч, П. Шэйн, Е. Раманаў, М. Федароўскі, З. Радчанка, У. Дабравольскі, А. Грыневіч, А. Шлюбскі, С. Сахараў, Р. Шырма, Г. Цітовіч.

Публ.: Носович И. И. Белорусские песни, «Записки имп. Русского географического общества по отделению этнографии», 1873, т. 5; Шейн П. В. Материалы для вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны, ч. 1, Мн., 1927; Беларускія народныя песні. Запісаў Р. Р. Шырмы, т. 3, Мн., 1962.

Літ.: Нікольскі М. М. Міфалогія і абрадавасць валачобных песень, Мн., 1931; Гілевіч Н. С. Наша родная песня, Мн., 1968.

І. У. Саламевіч. Мінск.

ВАЛАЧЭННЕ, працягванне металічных загатовак круглага ці фасоннага папярочнага сячэння праз адтуліну меншых памераў.



Валачыльны стан і схема валачэння.

Робіцца на валачыльных станах, асн. часткі якіх: валока (фільера) — пліта з цвёрдага сплаву або алмаза з адтулінамі і механізм выцяжкі. Існуюць станы з прамалінейным рухам загатоўкі (ланцуговыя, рэечныя, вінтавыя), якія ўжываюцца для В. трубаў, прутко́ў, і станы з намотваннем вырабаў малога сячэння (дроту) на барабан. В. пластычных металаў робіцца без награвання. Дрот з вальфраму ці малібдэну перад працягваннем праз фільеру награецца да т-ры рэкрышталізацыі, а з хуткарэзных сталяў да т-ры 600—850 °С. За адзін праход плошча папярочнага сячэння меншае на 6—11%. Загатоўкі дыяметрам да 0,3 *мм* працягваюць праз фільеры з цвёрдых сплаваў, больш тонкія — праз алмазныя. В. можна атрымаць дрот дыяметрам да 0,01 *мм* і меней, а трубы з таўшчынёй сценкі да 0,1 *мм*. В. практыкуецца таксама для каліброўкі і паляпшэння мех. уласцівасцей загатовак і вырабаў.


Літ.: Юхвец И. А. Волочильное производство, ч. 1, 2 изд., М., 1965.

Я. І. Вярбіцкі. Мінск.

ВАЛГАГРАД (да 10.4.1925 Царыцын, да 10.11.1961 Сталінград), горад, цэнтр Валгаградскай вобл. РСФСР. Вял. порт на Волзе, чыг. вузел, аэрапорт. 818 тыс. ж. (1970).

Засн. ў 1589 на в-ве Царыцын (тат. Сарычын — жоўты востраў) пры сутоку р. Царыцы (тат. Сарысу — жоўтая вада) з Волгай. У 1615 перанесены на правы бераг Волгі. Да канца 18 ст. ваен. крэпасць. У 17—18 ст. цэнтр антыфеад. паўстанняў — у час *Сялянскай вайны пад кіраўніцтвам С. Ц. Разіна 1670—71* (май 1670), *Булавінскага паўстання 1707—08* (чэрв. 1708). У *Сялянскую вайну пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова 1773—75* (жн. 1774) горад штурмавалі паўстанцы. З 1782 павятовы горад Саратаўскай губ. З 2-й пал. 19 ст. чыгуначны, партовы і прамысл. цэнтр. У 1905 узнікла с.-д. арганізацыя. Рабочыя горада актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07 і ў Кастр. рэвалюцыі. Сав. ўлада ўстаноўлена 4(17).11.1917. У 1918—19 адзін з цэнтраў барацьбы супраць белагвардзейцаў, з 30.6.1919 да 3.1.1920 акупаваны імі. За актыўную барацьбу з белагвардзейцамі В. узнагароджаны баявым рэвалюц. сцягам ВЦВК (14.5.1919) і ордэнам Чырв. Сцяга (14.4.1924).

За гады пяцігодак горад вырас у вялікі прамысл. і культ. цэнтр. З 1934 цэнтр краю, з 1936 — вобласці. У Вял. Айч. вайну каля



Валгаград. Помнік-ансамбль на Мамаевым кургане. Скульптуры «Стаяць на смерць» і «Радзіма-маці» работы Я. В. Вучэціча.

сцен горада разбіта вялікая групоўка войск праціўніка (гл. *Сталінградская бітва 1942—43*). В.— горад-герой, 22.12.1942 устаноўлены медаль «За абарону Сталінграда». У ходзе баявых дзеянняў В. амаль поўнасцю зруйнаваны. Пасля вайны адноўлены. З-ды: тракторны імя Дзяржынскага, трактарных дэталяў і нармаляў, нафтавага абсталявання, мед. абсталявання, суднабудаўніча-суднарамонтны, металургічны, алюмініевы, нафтаперапрацоўчы. Прадпрыемствы хім. (гідролізны, кіслародны з-ды), дрэваапр. (пільні), харч. і лёгкай прамысловасці; вытворчасць буд. матэрыялаў. ДРЭС і ЦЭЦ. У 19 ст. горад складаўся з пасёлкаў, выцягнутых уздоўж Волгі на 60 *км*, меў прамавугольную сетку вуліц. Пасля Кастр. рэвалюцыі развіваўся як адзіны гарадскі арганізм. У 1942—43 было знішчана 85% жылога фонду. Адноўлівўся горад па ген. плане 1945 (кіраўнік калектыву К. Алабян). Тры планіровачныя раёны В., падзеленыя зялёнымі зонамі, злучаюцца надоўжнымі транспартнымі магістралямі. Плошчы і праспекты складаюць грамадскі цэнтр В. Гал. плошча Загінуўшых барацьбітоў праз Алею герояў злучаецца з параднай набярэжнай. Комплексная забудова горада вялася калектывам архітэктараў пад кіраўніцтвам В. Сімбірцава. На Мамаевым кургане помнік-ансамбль героям Сталінградскай бітвы (скульптар Я. Вучэціч, арх. Я. Белапольскі, 1963—67). 8 ВНУ, 18 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры, цырк, 3 музеі, планетарый.


Літ.: Савченко И. П., Липявкин А. Ф. и Калиниченко П. И. Царицын.— Сталинград.— Волгоград, Волгоград, 1967.

ВАЛГАГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (да 1961 Сталінградская), у складзе РСФСР. Утворана 10.1.1934 (як край, з 1936 — вобласць). Размешчана ў бас. ніжняй Волгі і сярэдняга цячэння Дона. Пл. 114,1 тыс. км². Нас. 2324 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 32 раёны; 18 гарадоў, 24 гар. пасёлкі. Цэнтр горад-герой Валгаград.

Волга падзяляе вобласць на 2 часткі: вах.— правабярэжную і ўсх.— Заволжа. Правабярэжжа больш высокае (Прыволжскае ўзв. да 358 *м*, паўн. частка ўзв. Ергені, усх. ч. Данской грады да 250 *м*, паўд.-ўсх. ч. Калацкага ўзв. да 240 *м*), парэзанае ярамі і лагчынамі. Заволжа — плоская нізіна (частка Прыкаспійскай). Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, буд. матэрыялы, спажыўная і магнезіяльная солі. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад —12 на ПнУ да —8 °С на ПдЗ, ліп. ад 22 на ПнЗ да 25 °С на ПдУ. Ападкаў ад 450 *мм* на ПнЗ да 270 *мм* на ПдУ за год. Бываюць сухавеі. Вегет. перыяд 180—200 дзён. Гал. рэкі: Волга і Дон з прытокамі Хапёр, Мядзведзіца, Іларыя. Цымлянскае (на Доне) і Валгаградскае (на Волзе) вадасх. Волга-Данскі суднаходны канал імя У. І. Леніна. Салёныя азёры: Эльтон, Горка-Салёнае, Баткуль, Сарпінскія. В. в. занята стэпам, паўд.-ўсх. частка паўпустыняй. Глебы правабярэжжа — паўд. і звычайныя чарназёмы, цёмна-каштанавыя, значна засоленыя; Заволжа — светла-каштанавыя, саланчаватыя. У далінах рэк алювіяльныя глебы. Пад лесам (дуб, клён, вярба) 4,2% тэр. Насельніцтва пераважна рускае. Жывуць украінцы, казахі, татары і інш. Сярэдняя шчыльн. 20,3 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 66%. Найб. гарады: Валгаград, Волжскі, Камышын, Урупінск, Міхайлаўка, Фралова, Калач-на-Дане.

Асн. галіны прамысл.— машынабудаванне, металаапрацоўка, металургія. З-ды: якаснага металу «Чырвоны Кастрычнік», трактарны імя Дзяржынскага, нафтавага абсталявання, мед. абсталявання, алюмініевы, сталядротаваканатны, суднабуд., трактарных дэталяў і нармаляў, трактарных матораў (Валгаград), аўтакранавы (Урупінск), ліцейна-механічны (Камышын), суднабудаўніча-суднарамонтны (Калач-на-Доне), рамонтна-механічны (Волжскі). Энерг. база прамысловасці — Волжская ГЭС імя XXII з'езду КПСС, ДРЭС і ЦЭЦ у Валгаградзе, Волжская, Камышынская і Міхайлаўская ЦЭЦ. Горназдабыўная прамысл. (Жырнаўскае, Каробкаўскае, Фралоўскае, Бахмецьеўскае, Саушкінскае радовішчы нафты). Хім. прамысловасць; шынны з-д, азбатэхнічных вырабаў (Волжскі), нафтаперапр., гідролізны, кіслародны (Валгаград), лакафарбавы (Камышын). Харч. прамысловасць: масларобныя з-ды (Валгаград, Дубоўка, Нікалаеўск, Міхайлаўка), кансервавыя (Урупінск, Камышын, Міхайлаўка), мукамольныя, кандытарскія і інш. прадпрыемствы. Прамысловасць буд. матэрыялаў (вытв. цэглы, чарапіцы, жалезабетонных вырабаў у Валгаградзе, Волжскім, Камышыне; цэменту і шыферу ў Міхайлаўцы; ванны ў Жырнаўскім, Камышынскім, Фралоўскім р-нах; гіпсу ў Валгаградзе і інш.). Дрэваапр. і тэкст. прамысловасць. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні збожжа і на жывёлагадоўлі. У вобласці (1970) — 239 калгасаў і 168 саўгасаў. Паслўная пл. ў 1969 (тыс. *га*) 5664, з іх пад збожжавымі 3786,2, кармавымі 1476,2, тэхн. 334, агародніна-бахчавымі і бульбай 70,9. Асн. збожжавыя культуры пшаніца (1840,4 тыс. *га*) і ячмень (1462,2 тыс. *га*). Сеюць жыта, проса. З тэхн.— сланечнік (201,7 тыс. *га*) і гарчыца (140 тыс. *га*). У 1969 было 55,1 тыс. *га* арашоных зямель. Жывёлагадоўля воўна-мяснога і мяса-малочнага кірунку. На пач. 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 1425,7 (у т. л. кароў 496,8), свіней 853, авечак і коз 2647,4. Рыбалоўства. Даўж. чыгунак 1640 *км*, шашэйных дарог 18,6 тыс. *км* (1969). Суднаходства на Волзе, Доне, Волга-Данскім канале імя У. І. Леніна. 6 ВНУ, 35 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 5 тэатраў, 4 музеі. Абл. газета «Волгоградская правда».

Літ.: Волгоградская область. Физико-географический и экономико-географический обзор, Волгоград, 1970. *Я. Ф. Фёдарава.* Масква.



ВАЛДАЙСКАЕ ЎЗВЫШША, апошняе абледзяненне Рускай раўніны ў чацвярцічны перыяд. Назва прапанавана ў 1926 сав. геолагам А. П. Паўлавым. Супастаўляецца з вюрмскім абледзяненнем у Альпах, віслінскім у Германіі і варшаўскім 1-м у Польшчы. Працягласць 80 тыс. гадоў. Закончылася 10 тыс. гадоў назад. Адклады В. а. залягаюць на муравінскіх (мікулінскіх) і перакрываюцца перадбарэальнымі галацэнавымі ўтварэннямі (ранні галацэн паводле М. І. Нейштата). Комплекс утварэнняў В. а. складаецца з марэнных, канечнамарэнных, водналедавіковых, перыгляцыяльных (лёсавых, эолавых, азёрных і інш.) адкладаў. У працэсе растання валдайскі ледавік пакінуў некалькі выразна азначаных у рэльефе пасоў краявых ледавіковых утварэнняў. У многіх месцах паміж гарызонтамі ледавіковых адкладаў трапляюцца пясчана-гліністыя пароды з рэшткамі цеплалюбнай флоры. На гэтай падставе даследчыкі вылучаюць розную колькасць валдайскіх абледзяненняў, або стадый. Г. Ф. Мірчынк, І. П. Герасімаў, К. К. Маркаў, Н. С. Чабатарова, Л. М. Вазнячук і інш. прызнаюць адно абледзяненне з розпай колькасцю стадый і фаз адступання. А. І. Масквіцін, У. П. Грычук, М. М. Цапенка і інш.— два, С. А. Якаўлеў, М. І. Апухцін і інш.— тры.

Паўд. мяжа В. а. праходзіць на Пд ад Аўгустова (ПНР), па паўд. мяжы Беларускага Паазер'я, па правым беразе Дняпра ад Оршы да Смаленска, на Вышні Валачок, на Пн ад Чарапаўца, па правабярэжжы р. Покшаньга, па вярхоўях рэк Мязень і Пеза. В. а. ахоплівала толькі Пн Беларусі *(Беларускае Паазер'е)*. Тут некалькі палос краявых утварэнняў, якія адпавядаюць стадыям і фазам адступання ледавіка. Магутнасць ледавіковых адкладаў да 60 *м*, часам да 110 *м* (у зонах краявых утварэнняў і ў далавіковых далінах).

На Пд ад мяжы былога ледавіка намнажаліся водналедавіковыя, азёрныя, лёсавыя і інш. адклады. У перыяд адступання ледавіка макс. стадыі фарміраваўся алювій другіх (верхніх) надпоймавых тэрас Дняпра, Бярэзіны і інш. рэк, пры растанні ледавіка наступных стадый — алювій першых (ніжніх) надпоймавых тэрас. На водападзелах утваралася глеба, рэшткі якой знойдзены ў Цімошкавічах, Горках, Крычаве, Рукавічах і інш. пунктах. З адкладамі В. а. на Беларусі звязаны радовішчы стужкавых гліп, лёсападобных суглінкаў і супескаў, пяску, жвіру і інш.

Літ.: Марков К. К., Лазуков Г. И. и Николаев В. А. Четвертичный период (ледниковый период — антропогеновый период), т. 1 — Территория СССР. К VII Международному конгрессу Ассоциации по изучению четвертичного периода (ИНКВА). США, 1965, М., 1965; Палеогеография и хронология верхнего плейстоцена и голоцена по данным радиоуглеродного метода. К VII конгрессу INQUA (США, 1965), М., 1965; Последний европейский ледниковый покров. К VII конгрессу INQUA (США, 1965), М., 1965; Цапенко М. М. и Махнач Н. А. Антропогеновые отложения Белоруссии, Мн., 1959. *Н. А. Махнач.* Мінск.

ВАЛДАЙСКАЕ ЎЗВЫШША (Валдай), на ПнЗ Рускай раўніны. Водападзел Волгі і рэк Балтыйскага м. Выш. да 343 *м*. Складзена з марэнных градаў і ўзгоркаў, у аснове

якіх ляжыць куэстападобны ўступ з вапняко ў і сланцаў дэвону і карбону. У межах В. ў. выдзяляюць 3 больш выразныя канечнамарэнныя грады: Валдайскую, Асташкаўскую, Вышневалоцкую з агор'ем Бежацкі Верх. Шмат азёраў: Селігер, Валдайскае, Пена і інш. Раён турызму.

ВАЛДАЙСКАЯ КУЛЬТУРА, культура неалітычных плямёнаў (2-е тысячагоддзе да н. э.), якія жылі на Валдайскім узв. Выдзелена і даследавалася Н. М. Гурынай. Насельніцтва займалася рыбалоўствам і паляваннем, ужывала крамяпёвыя прылады працы — ромбападобныя наканечнікі стрэлаў і коп'яў, скрабкі, сякеры і інш. Падабенства ў керамікі з паўд. і паўд.-зах. тэрыторыямі дае падставы меркаваць, што В. к. ўзнікла ў выніку пранікнення на Валдайскае ўзв. неалітычнага насельніцтва з Бел. Падняпроўя.

Літ.: Гурина Н. Н. Валдайская неолитическая культура, «Советская археология», 1958, № 3.

М. М. Чарняўскі. Мінск.

ВАЛДАЙСКАЯ СЕРЫЯ, адклады верхняй часткі геал. разрэзу *вендскага комплексу* праваю. Тэрмін прапанаваны Б. С. Сакаловым у 1951. Пашырана на З і ПнЗ Рускай платформы. На Беларусі вядома ў многіх раёнах (Смаргонь, Віцебск, Орша, Мінск, Столін, Брэст). Магутнасць В. с. да 500 *м*. У ніжняй частцы В. с. (гдоўская світа) складзена пераважна з пясчаных і алеўралітавых парод, у верхняй (котлінская світа) — з гліністых і алеўралітавых. У адкладах гдоўскага гарызонта прэсныя воды, якія шырока ўжываюцца для водазабеспячэння.

ВАЛЕВАЧЫ, вёска ў Чэрвеньскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 20 *км* на З ад Чэрвеня, 45 *км* ад Мінска, на шашы Мінск — Магілёў. 399 ж., двароў 107 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, сталовая, магазін, дзіцячы сад. Вёску амаль поўнасцю спалілі нямфашысты. Помнік сав. воінам і партызанам Вял. Айч. вайны.

ВАЛЕЙБОЛ (англ. volley-ball, ад volley адбіваць на ляту + ball мяч), спартыўная камандная гульня з мячом.

Вядзецца на пляцоўках памерам (*м*) 18×9, якія падзяляюцца ўпоперак сеткай, прымацаванай на выш. 2—2,45 *м*. Гуляюць дзве каманды па 6 чал. Мэта гульні — паслаць мяч па-над сеткай так, каб ігракі другой каманды не змаглі яго адбіць і каб ён апусціўся на іх пляцоўку. Адбіваць мяч можна толькі злёту і не больш як трыма ўдарамі адной каманды. Пры памыліцы мяч перадаецца другой камандзе ці прайграецца ачко. Партыю выйграе каманда, якая першая набярэ 15 ачкоў ці дасягне перавагі ў 2 ачкі пасля ліку 14 : 14. На афіц. спаборніцтвах гуляюць 5 партый. Выйграе каманда, якая перамагла ў 3 партыях.

У В. упершыню пачалі гуляць у Амерыцы (1895). У СССР стаў пашырацца пасля Вял. Кастр. рэвалюцыі. Пяршынствы СССР праводзяцца з 1938. У 1964 В. уключаны ў праграму Алімп. гульняў. На Беларусі ў В. гуляюць з 1925. З 1946 валейбалісты БССР удзельнічаюць у пяршынствах СССР. Жаночая камандта т-ва «Спартак» (Мінск) у 1966 і 1967 займала 3-е месца на першынстве СССР.

Літ.: Швойлов А. В. Волейбол, Мн., 1969.

А. У, Івойлаў. Мінск.

ВАЛЕНСІЯ (Valencia), горад на У Іспаніі, адм. ц. вобласці і правінцыі Валенсія. Засн. рымлянамі ў 137 да н. э. Размешчаны пры ўпадзенні р. Турыя ў Валенсійскі заліў Міжземнага м. Порт, вузел чыгунак і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 500 тыс. ж. (1967). Прамысл. харчовая (асабліва тытунёвая і вінаробная), тэкст. (шаўковая і хім. валокнаў), шклокерамічная, цэментная, абутковая, папяровая; металаапрацоўка і суднабудаванне. Ун-т (з 1500).

ВАЛЕНТНАСЦЬ (ад лац. valentis які мае сілу), уласцівасць атама пэўнага элемента ўтвараць хімічныя сувязі з пэўнай колькасцю іншых атамаў.

Раней велічыню В. вызначалі лікам атамаў вадароду, з якімі атам дадзенага элемента можа звязвацца ці замяшчаць іх. Такое вызначэнне В. не страціла свайго значэння. Аднак у пач. 20 ст. высветлілася, што састаў, напр., комплексных злучэнняў нельга растлумачыць, карыстаючыся такім вызначэннем В. У сувязі з гэтым увялі тэрмін галоўная В. і дадаткова сталі карыстацца ўяўленнем пра пабочную В., якая вызначае здольнасць іонаў і хімічна звязаных атамаў утвараць пэўную колькасць каардынацыйных сувязей, адказных за ўтварэнне комплексных злучэнняў. Уяўленне пра В. атрымала развіццё ў квантава-механічнай тэорыі хім. сувязі.

Паводле квантава-механічнай тэорыі хім. сувязі велічыня галоўнай В. атама (яе часта наз. проста В.) вызначаецца лікам электронных пар, якія ўзнікаюць у працэсе ўтварэння хім. сувязей паміж дадзеным і інш. атамамі. Электроны, што ўваходзяць у састаў электронных пар, наз. валентнымі. Яны размешчаны на знешнім электронным слаі атамаў. У атамах элементаў з недабудаваным перадапошнім слоем (напр., у атамаў Fe, Mn, W) валентныя могуць быць некалькі электронаў гэтага слоя. Многія элементы маюць пераменную В., што дае ім магчымасць утвараць з адным элементам некалькі злучэнняў. Пры вызначэнні велічыні гал. В. не мае значэння, ці гэты атам утварае кавалентныя непалярныя сувязі, ці ён звязаны іоннымі або палярнымі сувязямі. Аднак у апошнім выпадку паняцце В. ўдакладняюць, выкарыстоўваючы ўяўленне пра дадатную ці адмоўную электравалентнасць або проста пра дадатную ці адмоўную В. Абсалютная велічыня электравалентнасці паказвае колькасць палярных або іонных сувязей, якія ўтварае дадзены атам, а знак яе — зарад, які набывае атам пры ўтварэнні гэтых сувязей. Напр., у злучэнні Na_2SO_4 электравалентнасць серы +6, патрыю +1, кіслароду −2. Замест тэрміна «электравалентнасць» часта ўжываецца тэрмін «ступень акіслення». Гл. таксама *Хімічная сувязь, Малекула.*

Літ.: Курс химии, ч. 1, под ред. Г. А. Дмитриева и др., М., 1967; Карапетьянц М. Х. и Дракин С. И. Строение вещества, М., 1967.

В. В. Свірыдаў. Мінск.

ВАЛЕНЦІК Дзмітрый Данілавіч [10(23).2. 1907, в. Райкава Полацкага пав. Віцебскай губ.— 30.3.1969], Герой Сав. Саюза (1940). З сялян. Чл. КПСС з 1930. У Чырв. Арміі з 1929. У сав.-фінляндскую вайну 1939—40 камандаваў эскадрылляй, якая тройчы дзейнічала ў глыбокім тыле ворага, каб знішчыць

яго аператыўна-стратэгічную базу каля Рованіемі, вбіла ў паветр. баях 5 варожых знішчальнікаў. У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Сталінградскім, Паўд., 4-м Укр. і 3-м Бел. франтах. З 1944 у інспекцыі ВПС Сав. Арміі.



ВАЛЕНЫ АБУТАК, абутак, выраблены з шарсці шляхам яе ўшчыльнення (валёнкі, боты, туфлі і інш.). Ручная вытворчасць В. а. (шапавальства) у дарэвалюц. час найб. пашырылася ва Усх. Беларусі. Шырока вядомы дрыбінскія шапавалы (з мяст. Дрыбін). З прыладамі для апрацоўкі воўны яны вандравалі па вёсках Беларусі, сумежных губерняў Расіі, Зах. Украіны. Потым узніклі майстэрні для вырабу В. а. з выкарыстаннем на некат. аперацыях прасцейшых машын і механізмаў. Сучасны працэс вырабу В. а. механізаваны. У БССР В. а. выраблялюць Бабруйская, Навагрудская і Смілавіцкая валюшна-лямцавыя ф-кі, Гарадоцкі і Слонімскі прамкамбінаты. У 1969 яны выпусцілі 1 млн. 42 тыс. пар В. а.

В. а. бывае танкашэрсны ці грубашэрсны (уцяжараны; сярэдні, або звычайны; тонкі, або часаны). Паводле нумароў, якія вызначаюцца ўнутранym памерам следу ў сантыметрах, В. а. падзяляецца на дзіцячы дашкольны (13—17), школьны (18—22), жаночы (23—27), мужчынскі (26—32). Пры вырабе В. а. шэрсць, а таксама штучныя валокны распушваюць на трапальных і шчыпальных машынах, замасліваюць і змешваюць у спец. машынах. Потым на часальных машынах перапрацоўваюць на вату, якая ідзе на загатоўкі для асновы (конуса) В. а. Аснову робяць наслойваннем ватовых загатовак адпаведна форме гатовага вырабу, але ўдвая большага памеру. Каб атрымаць мяккі лямец, пры валенні яе ўшчыльняюць. На валюшных машынах валокны лямцу пад дзеяннем мех. намаганняў (сціскання, удараў), гарачай вады і сернай к-ты больш шчыльна перапляцюцца, і аснова набывае патрэбныя памеры. Пасля 2-га перыяду валення (усіх 4) аснову фарбуюць. Канчатковую форму В. а. надаюць на мех. калодках насадачных машын. Гл. таксама *Абутак.*

Літ.: Кузьмичев Ф. И. и Левин М. И. Производство валяной обуви и войлоков, М., 1962; Мертвищев Ю. И. Использование химических волокон в валяльно-войлочном производстве, М., 1967.

Н. М. Хрушчова. Мінск.

ВАЛЕЎКА, вёска ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Нёўда, каля воз. Свіцязь (4 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Свіцязь». За 17 *км* на Пд ад Навагрудка, 180 *км* ад Гродна, 29 *км* ад чыг. ст. Навагрудак — Баранавічы і Навагрудак — Нараўлічы. 434 ж., двароў 139 (1970). Пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, зубапратэзная майстэрня, вет. ўчастак, адд. сувязі, сталовая, 4 магазіны. Пры бурж.-Польшчы (1921—39) у В. дзейнічала падпольная ячэйка КПЗБ. Помнік савецкім воінам і партызанам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На ПдУ ад В. стаянка часоў позняга неаліту.

ВАЛЕР (франц. valeur літар. каштоўнасць), тэрмін, якім у жывапісе абазначаюцца адценні тону ці градацыі святла і цяню ў межах аднаго колеру.

ВАЛІДОЛ, лякарства. 25—30-працэнтны раствор ментолу ў ізаваляр'янава-ментолавым эфіры. Празрыстая бясколерная масляністая вадкасць з пахам перцавай мяты. Заспакойвае цэнтр. нерв. сістэму і расшырае сасуды. Ужываецца ўнутр у кроплях (3—5 на кавалачак цукру) ці ў таблетках супраць стэнакардыі, істэрыі, марской і паветранай хвароб, пры рвоце ў цяжарных; а таксама ў мазі ад свербу скуры.

ВАЛІН $(CH_3)_2CH \cdot CH(NH_2)COOH$, α-аміназаваляр'янавая кіслата, адна з незаменных *амінакіслот.* Крышталічнае рэчыва. Добра растваральна ў вадзе. Будову В. вызначыў і даказаў сінтэзам ням. біяхімік Э. Фішэр у 1906. Есць амаль ва ўсіх бялках. Найб. яго ў казеіне малака (7—9%). Каб гарантаваць падтрыманне *авоцістай рэзервы* ў арганізме, даросламу чалавеку на суткі трэба 1,6 *г* В. Адсутнасць яго ў ежы затрымлівае рост, вядзе да дэгенератыўных змен у нервовай сістэме. В.— састаўная частка антыбіётыка граміцыдыну.

ВАЛІЦКІ Аляксандр (1826, Вільня — 1893), удзельнік грамадскага руху на Беларусі ў 60-я г. 19 ст. Скончыў Маскоўскі ун-т. У Мінску заснаваў кнігарню, вакол якой групавалася перадавая інтэлігенцыя. У пач. 1863 за ўдзел у антыўрадавых дэманстрацыях высланы ў Тамбоў. Пасля працаваў у варшаўскай прэсе, бібліятэкарам і архівістам у Нясвіжы. У манаграфіі «Станіслаў Манюшка» (Варшава, 1873) цікавыя звесткі пра супрацоўніцтва кампазітара з В. Дуніным-Марцінкевічам, у працы «Нашы памылкі ў размове і пісьме» (некалькі выданняў) — пра ўплыў бел. мовы на польскую.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

ВАЛІШЧА, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 38 *км* на ПнЗ ад Пінска, 285 *км* ад Брэста, 36 *км* ад чыг. ст. Пінск, на шашы Пінск — Іванцэвічы. 1667 ж., гасп. 351 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, краязнаўчы музей, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін.

ВАЛКАВАЛЬНІК, 1) навясное абсталяванне да трактара для прыбірання пнёў з тарфянога поля і складвання іх у валкі. На торфапрадпрыемствах Беларусі выкарыстоўваюць В. ротарнага тыпу. Пры руху ротар падхоплівае іклямі пні і адкідвае іх уперад і ўбок. Шыр. захопу 2,4 *м*. За гадзіну апрацоўвае да 0,7 *га*. 2) Машына, якая збірае фрэзерны торф у валкі. У БССР пашыраны пнеўматычныя В.: маюць 8 соплаў, якімі ўсмоктваюць тарфяную крошку ў бункер, а шнэкам выгружаюць яе ў валок. Шыр. захопу 8 *м*. Есць таксама скрабковыя В., у якіх адвалы прымацоўваюцца пад вуглом адзін да аднаго. Шыр. ўваходу ў секцыю ў 4—5 разоў большая за шыр. выхаду.

Літ.: Опейко Ф. А. Торфяные машины, Мн., 1968.

ВАЛКАДАЕЎ Пётр Іванавіч [н. 9(22).11.1911, в. Кажамякі Бугурусланскага пав. Самарскай губ.], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1940. З сялян. Скончыў літ. ф-т Куйбышаўскага пед. ін-та. З 1936 настаўнічаў. З 1939 у Сав. Арміі. У Айч. вайну ўдзельнічаў у партыз. руху на Беларусі. Супрацоўнічаў (1944—55) у рэсп. газетах у Мінску. З 1955 літ. кансультант газ. «Знамя юности». Друкуецца з 1934. Аўтар аб. вершаў «Родная старонка» (1950), «Чандра» (1952), «Зялёная прыстань» (1960), «Лівень» (1967), аб. нарысаў «Будаўнікі» (1956), «Механізатар Андрэй Худзякоў» (1961), «Ветэран» (1963). Піша творы для дзяцей (аб. апавяданняў «Ягоркавы рапарты», 1958; аповесць «Чый хлопчык?», 1961). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі.

ВАЛКАЛАТА, вёска ў Докшыцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Памяць Ільіча». За 32 *км* на З ад Докшыц, 212 *км* ад Віцебска, 19 *км* ад чыг. ст. Параф'янава. 374 ж., двароў 120 (1970). Швейная майстэрня, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, вет. ўчастак, адда. сувязі, 3 магазіны. Помнік 45 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАЛКОВІЧ Даніла Іванавіч [5(18).4.1900, в. Запёманск Мастоўскай вол. Гродзенскай губ.— 1943], парт. і дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1918. У 1915 з бацькамі эвакуіраваўся ў Малмыжскі пав. Вяцкай губ., там уключыўся ў рэвалюц. рух. З крас. 1918 у Чырв. Арміі, удзельнік ліквідацыі белагвардзейска - эсэраўскага мяцяжу на Іжаўскім аброевым заводзе. Працаваў нам. старшыні надзвычайнай камісіі Малмыжскага пав., сакратаром павят. к-та РКП(б). З жн. 1920 на польскім фронце. Вёў барацьбу з бандытызмам у Бабруйскім, Мазырскім пав. У 1921—24 у ЦК КСМБ, у 1924—34 сакратар Койданаўскага (з 1932 Дзяржынскага), Ляхаўскага (г. Мінск) райкомаў, заг. аддзела Мінскага, сакратар Магілёўскага акруговых, Клімавіцкага, Бабруйскага раённых к-таў КП(б)Б, нам. наркома земляробства БССР. З 3.8.1934 да 10.6.1937 другі сакратар ЦК КП(б)Б, з 30.5 да 8.9.1937 старшыня СНК БССР. Чл. Бюро ЦК КП(б)Б з 3.8.1934 да 25.10.1937. Чл. ЦВК БССР (1931—37). Імем В. названа вуліца ў Гродне.



У. Д. Якутаў. Мінск.

ВАЛЛЕ, расшыраная частка страваводу (птушак, насякомых, малюскаў), у якой захоўваецца ежа перад паступленнем у страўнік, а ў некат. жывёл і папярэдне ператраўляецца. Вялікае В. ў драпежных птушак (яны за адзін раз заглынаюць многа ежы) і ў верляедных (верне ў В. набракае і размякчаецца). Добра развіта В. ў насякомых, якія жывяцца сокамі раслін. Нектар кветак у В. пчол пад дзеяннем ферментаў слiны ператвараецца ў мёд.

ВАЛЛЯК ТАКСІЧНЫ (**базедава хвароба, базедаў валляк, хвароба Грэйвса, тырэатаксікоз**), хвароба, пры якой павялічваецца шчытападобная залоза і павышаецца яе функцыя.

Развіццю В. т. садзейнічаюць інфекцыі (грып, запаленне мiндалін), парушэнні функцыі залоз унутранай сакрэцыі (лечнікаў), псіхічныя ўрушэнні, перагравanне на сонцы. У хворых парушаецца дзейнасць цэнтр. і вегетатыўнай нервовых, сардэчна-сасудзістай, эндакрыннай і інш. сістэм. Чалавек худзее, хутка стамляецца, вочы робяцца выпуклыя, з'яўляецца плаксівасць, палахлівасць (т. зв. базедавічны характар). Формы В. т.: дыфузная, вузлавая і мяшаная. Усе вузлавыя і мяшаныя формы лечаць хірургічна, пры дыфузнай назначаюць сардэчныя сродкі, прэпараты ёду, мерказаліл, метатырын, радыеактыўны ёд. Калі за 8—10 месяцаў лячэнне не дае эфекту, патрэбна аперацыя. Прафілактыка: правільны рэжым працы і адпачынку, загартоўванне арганізма, аздараўленне мiндалін.

Літ.: Гл. пры арт. *Валляк эндэмічны.*

В. Р. Астапенка. Мінск.

ВАЛЛЯК ЭНДЭМІЧНЫ (**валляковая хвароба**), развіваецца ад недастатковага забеспячэння арганізма ёдам і выяўляецца ў павелічэнні шчытападобнай залозы. Мае ачаговы характар (хварэюць жыхары пэўных мясцовасцей, у т. л. і Беларусі). Бывае: разліты (дыфузны), вузлавы (надозны) і мяшаны (дыфузна-надозны).

Паводле агульных прыкмет падзяляецца на эўтырэоідны, гіпертырэоідны і гіпатырэоідны. Эўтырэоідны не выклікае прыкметных псіхічных і фіз. змен у арганізме і сустракаецца найб. часта. Пры гіпертырэоіднай форме павышаецца функцыя шчытападобнай залозы (колькасць яе гармонаў павялічваецца), з'яўляюцца прыкметы тырэатаксікозу. Гіпатырэоідная форма характарызуецца паніжаннем функцыі шчытападобнай залозы і парушэннем росту, псіхікі, абмену рэчываў.

Лячэнне: пры дыфузнай і мяшанай формах назначаюць ёдзістыя прэпараты. Калі яны не даюць эфекту, робіцца хірургічная аперацыя. Вузлавыя формы В. э. лечаць хірургічна.

Літ.: Алешин Б. В. Зобная болезнь и тиреотоксикоз, Киев, 1965 (бібліягр.); Грейман А. А. Хирургическое лечение и патоморфология зоба, Мн., 1964; Николаев О. В. Эндемический зоб, М., 1955.

А. А. Грэйман. Мінск.

ВАЛОБА, возера ў бас. р. Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 3,16 *км²*. Даўж. 3 *км*, найб. шыр. 1,25, сярэдняя 1,1 *км*. Катлавіна складаная, выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (54,9 *км²*) узгорыста-марэнны. У возера з З упадае р. Студзёніца. В. зарастае слаба. Водзяцца гусцяра, лешч, шчупак, судак, плотка, акунь і інш.

ВАЛОВІЧ Міхаіл Казіміравіч [6(18).6.1806, маёнтак Парэчча Слонімскага пав. Гродзенскай губ.— 21.7(28).1833], удзельнік вызв. руху на Беларусі. З сям'і слонімскага падкаморыя. Удзельнік польскага паўстання 1830—31. Пасля яго разгрому эмігрыраваў у Францыю. У 1833 тайна вярнуўся на радзіму і ўдзельнічаў у новай спробе падняць паўстанне на тэр. Польшчы, Украіны, Літвы і Беларусі. Створаны В. невялікі сялянскі паўстанцкі атрад разбіты ўрадавымі войскамі, а сам ён арыштаваны і павешаны ў Гродне. В. крытычна ацэньваў вопыт паўстання 1830—31.

якое, на яго думку, не мела «агульначалавечай мэты», бо выказвала інтарэсы шляхты. Падышоў да разумення таго, што ў вызв. барацьбе асн. сілай павінны быць нар. масы, пераважна сялянства. Выступаў за адмену прыгону, за права кожнага народа на самастойнае існаванне.

Літ.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры, Мн., 1969, с. 191—194; Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza Michała Wołłowicza z r. 1833, Grodno, 1934 (Biblioteka historyczna m. Grodna, t. 2); Danielewicz J. [Dyskusja], «Kwartalnik Instytutu Polsko-Radzieckiego», 1955, № 1—2. *Н. М. Махнач.* Мінск.

ВАЛОВІЧЫ, беларускі шляхецкі (у 1798—1900 графскі) род, прадстаўнікі якога ў 15—18 ст. займалі дзярж. пасады на Беларусі і ў Літве, валодалі маёнткамі ў Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай і Ковенскай губ. Заснавальнік роду Ходка.

Сярод іх найбольш вядомыя:

Грэгоры Багданавіч (г. н. невяд.— п. 1577), прыдворны каралеў у 1548, староста мсцібаўскі ў 1559 і 1565, маршалак каралеўскі і староста слонімскі з 1560, пасол у Маскве ў 1563, гарадніцкі гродзенскі, дзяржаўца эйшышскі, канеўскі, варнянскі, дубіцкі і вальвенскі з 1565, лоўчы літоўскі з 1569, ваявода смаленскі з 1573.

Геранім (г. н. невяд.— п. 1636), сын Грэгорыя Багданавіча, каралеўскі сакратар і пісар літоўскі у 1589, падскарбі дворны з 1600, падскарбі земскі літоўскі з 1605, падканцлер літоўскі ў 1618, староста жмудскі ў 1619.

Астафі Багданавіч (г. н. невяд.— п. 1587), брэсцкі падстароста з 1550, каралеўскі пісар у 1552, пасол у Маскве ў 1553, маршалак каралеўскі і пісар, памочнік літоўскага канцлера, староста магілёўскі з 1554, маршалак дворны і падскарбі земскі літоўскі з 1561, падканцлер літоўскі з 1566, староста брэсцкі і кобрынскі ў 1567—87, староста рэчыцкі з 1576, канцлер літоўскі і кашталян віленскі, камандзір пяхоты Вял. кн. Літоўскага пры асадзе Полацка ў 1579. Адзін з лідэраў апазіцыі *Люблінскай уніі 1569*, разам з інш. бел. і літ. феадаламі, праціўнікамі аб'яднання Вял. кн. Літ. з Польшчай, пакінуў Люблінскі сейм, накіроўваў у Падляссе і Валынь адозвы з заклікам змагацца супраць уніі.

Уладзіслаў (г. н. невяд.— п. 1668), пісар польны літоўскі з 1639, у час *вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54* замяніў вялікага гетмана літоўскага і ўзначаліў адзін з атрадаў, які некалькі разоў быў пераможаны казакамі і паўстанцамі. Удзельнічаў у вайне Рэчы Паспалітай з Рус. дзяржавай 1654—67, узначальваў з 1659 войска Вял. кн. Літ., у 1655 ваявода віцебскі, у 1666 гетман польны літоўскі.

Павел (г. н. невяд.— п. 1643), падскарбі вялікі літоўскі з 1640.

Антоні Эразм (1711—70), канонік віленскі з 1742, вялікі пісар літоўскі і сакратар вялікі літоўскі з 1744.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.


ВАЛОДЗЬКА Іосіф Ігнатавіч (ліст. 1887, мяст. Замір'е Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 20.12.1937), адзін з арганізатараў парт. падполля і партыз. руху на Беларусі ў грамадзянскую вайну, дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з кастр. 1917. У 1917 нач. палявога рэвалюц. штаба. У 1918 на акупаванай немцамі чыг. ст. Замір'е Навагрудскага пав.: адзін са стваральнікаў падпольнай парт. арг-цыі, член, потым сакратар Замір'еўскага падпольнага падрайкома РКП(б). У 1919 павятовы ваенком і нач. баявога ўчастка, у 1920—21 губваенком. У 1922—24 старшыня выканкома Магілёўскага павятовага, у 1924—28 Бабруйскага раённага Саветаў. З 1928 нам. наркома земляробства БССР. У 1929—30 старшыня Віцебскага акруговага, з 1931 Мінскага гарадскога выканкомаў. У 1933—37 нач. управлення сувязі БССР, упаўнаважаны Наркамата сувязі СССР па БССР; з сак. 1937 упаўнаважаны Наркамата сувязі СССР па Казахскай ССР. На XII—XV з'ездах КП(б)Б выбіраўся чл. ЦК, чл. ЦВК СССР і ЦВК БССР. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга БССР.

ВАЛОДЗЬКІ, вёска ў Маладзечанскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 37 *км* на ПдУ ад Маладзечна, 46 *км* ад Мінска, 5 *км* ад чыг. ст. Аляхновічы, на шашы г. п. Радашковічы — в. Ракаў. 405 ж., двароў 89 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ВАЛОЖЫН, горад, цэнтр Валожынскага р-на Мінскай вобл. На р. Валожынка, за 75 *км* на ПнЗ ад Мінска, 17 *км* ад чыг. ст. Валожын, на шашы Мінск — Гродна. 5,8 тыс. ж. (1969).

Упершыню ўпамінаецца ў дакументах 14 ст. У 15—17 ст. цэнтр Валожынскага ўдзельнага княства. Горадам валодалі Слушкі, якія заснавалі ў В. бернардзінскі манастыр, а пры ім школу (1681); пазней належаў Монвідам, Гаштольдам, Радзівілам, Чартарыйскім, з 1803 — Тышкевічам. У часы Рэчы Паспалітай уваходзіў у Навагрудскае ваяводства; у 19 — пач. 20 ст.— у Ашмянскі пав. Віленскай губ. Стараж. цэнтр гандлю жывёлай і с.-г. сыравінай. Паводле перапісу 1897 у В. 4533 ж. У 1906 у В. дзейнічала група РСДРП (30—50 чл.

Валожын. Вуліца Савецкая.



партыі), якая вяла рэвалюц. прапаганду сярод сялян, распаўсюджвала адозвы, выдадзеныя Віленскім к-там РСДРП: «Дума і цар», «Да сялян» і інш. У ліст. 1917 у В. створаны Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. 19.2.1918 акупаваны Германіяй. Паводле Рыжскага дагавору 1921 увайшоў у склад бурж. Польшчы, павятовы горад Навагрудскага ваяводства. У 1924—38 рэвалюц. дзейнасць у В. ўзначальваў падпольны Валожынскі райком КПЗБ; у 1925—27 дзейнічалі арг-цыі Беларускай сялянска-рабочай грамады; у 1935—39 у В. адбылося 5 забастовак, у якіх удзельнічала каля 6 тыс. чалавек. У Вял. Айч. вайну на тэр. раёна дзейнічалі партыз. атрады. Вызвалены Сав. Арміяй 5.7.1944. У В. парадзіўся і жыў бел. паэт *Стары Улас*. З арх. помнікаў абаронаваліся: касцёл (1681) і колішні палац Тышкевічаў.


У В. райпрамкамбінат з ліцейным цэхам, масласырзавод, камбінат быт. абслугоўвання, Міжкалгасбуд, машынна-меліярац. станцыя, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, лясгас. 3 сярэднія (у т. л. школа-інтэрнат), музычная і спартыўная дзіцячыя школы, 4 дашкольныя ўстановы, Дом піянераў, Дом культуры, 2 б-кі, гідраметэастанцыя, бальніца.

Я. Н. Мараш. Гродна.

ВАЛОЖЫНКА, рака, правы прыток р. Іслач (бас. Нёмана). Даўж. 35 *км*. Пачынаецца на паўд.-ўсх. ускраіне Ашмянскага ўзв., цячэ ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Вадазбор (168 *км*²) у верхняй частцы ўзвышаны, дробнаўзгорысты, перасечаны; сярэдняя і ніжняя часткі — плоская, забалочаная і залесеная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 1,1 *м*³/*сек*. На В.— г. Валожын.


ВАЛОЖЫНСКІ РАЁН, у складзе Мінскай вобл. Утвораны 15.1.1940. На захадзе вобл. Пл. 2 тыс. *км*². Нас. 74,7 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 19 сельсаветаў; г. п. Івянец. Цэнтр г. Валожын.

Рэльеф пераважна хвалісты. Усх. частку раёна займае Мінскае ўзвышша з выш. да 335 *м* над узр. м. На Пн адгор'і Ашмянскага ўзв. На ПдЗ — забалочаная Нёманская нізіна, з якою мяжуюць больш павышаныя нізіны пі: 2 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 15,2 млн. *м*³ (у т. л. Бярэзінскае радовішча 14,3 млн. *м*³), ёсць цагельныя гліны — 0,3 млн. *м*³, радовішча торфу (Забалаць — 3,6 млн. *т*). Сярэдняя т-ра студз. ад —6,5 да —7, ліп. 17—17,5 °С. Ападкаў 660 *мм* за год. Вегет. перыяд 190 дзён. Гідраграфічная сетка даволі густая. Самая вялікая рака Бярэзіна (прыток Нёмана) на ПнЗ раёна і яе прытокі Гальшанка, Волка і Іслач з прытокам Волма. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (60%), дзярнова-падзолістыя часова ўвільготненыя (20%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (7,8%), дзярнова-глеяватыя (1,3%), дзярнова-глеевыя (3,7%), тарфяна-балотныя (3,1%), поймавыя (2,6%), поймавыя тарфяна-балотныя (1,5%). З мінер. глебаў 52,9% суглінкавыя, 39,9 супясчаныя, 7,2% пясчаныя. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 48 (цана бала 0,26 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 22, с.-г.— 40. Пад лесам 35% тэр., асн. лясныя масівы на ПдЗ раёна (Налібоцкая пушча). Каля ²/₃ пл. лесу займаюць хвойныя пароды. З лісцевых бяроза, вольха, асіна, дуб.



Рака Іслач каля в. Падневічы.

Насяляюць раён беларусы, ёсць палякі, рускія. Сярэдняя шчыльн. 37,3 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 12,2%. Прамысл. прадпрыемствы: райпрамкамбінат (з ліцейным цэхам), які выпускае чыгуннае ліццё, пячное гасп. ліццё, кантэйнеры на бульбу і марожанае, металаканструкцыі, каналізацыйныя люкі, кафлю і інш. 2 камбінаты быт. абслугоўвання, 2 арг-цыі Міжкалгасбуда. У 1967 створана лясная машынна-меліярац. станцыя, якая на пач. 1969 асушыла 1100 *га* забалочаных лясоў. У Валожыне масласырзавод, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, лясгас. У Івянцы ф-ка мастацкай керамікі і вышыўкі, кансервавы з-д, хлебазавод, птушкафабрыка. У раёне 24 калгасы і 7 саўгасаў (1970).



Калгасы і іх цэнтры: «Большавік» *(Пугачы)*, «Беларусь» *(Волма)*, «Верны шлях» *(Пральнікі)*, імя Гастэлы *(Сувазды)*, імя М. Горкага *(Вішнева)*, «Запаветы Ільіча» *(Манькаўшчына)*, «Камсамолец» *(Судзілкі)*, «Краіна Саветаў» *(Гародзькі)*, імя Куйбышава *(Забрэззе)*, імя Леніна *(Валожын)*, імя К. Маркса *(Пяршаі)*, імя Мічурына *(Семярнікі)*, «Перамога» *(Філіпяты)*, «1 Мая» *(Сакаўшчына)*, «Праўда» *(Дзямяновічына)*, «Радзіма» *(Узбалаць)*, «Світанне» *(Сівіца)*, «17 верасня» *(Брылькі)*, імя Суворава *(Саланая)*, імя Чапаева *(Лоск)*, імя Чарпахоўскага *(Адамова)*, «Чырвоная гвардыя» *(Дварэц)*, «Чырвоны партызан» *(Белакорац)*, «Чырвоны сцяг» *(Доры)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Багданаўскі» (пас. *Багданаў*), «Залескі» *(Новы Двор)*, імя Малюгоўскага *(Камень)*, «Падбярэззе» *(Падбярэзъе)*, «Радзіма» *(Крыніцы)*, «Ракаўскі» *(Ракаў)*, «Праца» *(Выгавічы)*.


Пад с.-г. ўгоддзямі каля 45% тэр. раёна. Асушаюцца балоты і забалочаныя землі. Асушана 8,2 тыс. *га* (на 1970). Пасяўная пл. ў 1969 (тыс. *га*) 63,8, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 27,8, кармавымі 20,4, бульбай 10,7, тэхнічнымі (лён-даўгунец, цукр. буракі) 4,5. Жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. На 1.1.1970 (тыс. галоў) буйн. раг жывёлы 58,9 (у т. л. кароў 31,0), свіней 57,1, авечак і коз 5,5. Па тэр. раёна праходзяць чыг. Маладзечна — Ліда, шашэйныя дарогі Мінск — Ліда, Маладзечна — Валожын, Валожын — Івянец — Стоўбцы, Валожын — ст. Валожын. На пач. 1970 у раёне было 129 агульнаадук. школ (у т. л. 15 сярэдніх, 45 васьмігадовых, 66 пачатковых, 3 школы рабочай і сельскай моладзі), 9 дашкольных устаноў, 2 муз. школы, 58 б-к, 46 клубаў, 54 кінаўстаноўкі (у т. л. 21 стацыянарная), 9 бальніц, 32 фельч.-ак. пункты. Дзіцячы санаторый. У 1970 у раёне працавала 800 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 41 інжынер, 48 аграномаў, 25 заатэхнікаў, 18 вет. урачоў, 503 настаўнікі; 1528 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Працоўная слава».

В. П. Варанцова. Мінск.

ВАЛОКА, зямельная мера на Беларусі, у Літве, Польшчы і на Украіне. На Беларусі існавала з сярэдзіны 16 ст. да першых гадоў Сав. улады.

Памер зямлі на В. пачаўся ў 1552—55 ва ўладаннях каралевы Боны, пасля *«Уставы на валокі»* 1557 — у дзярж. маёнтках вах. і цэнтр. Беларусі і ў Літве, а на ўсход ад р. Бярэзіны — з сярэдзіны 17 ст., пазней — на землях магнатаў, шляхты і духавенства. У многіх дробных землеўладальнікаў памер на В. не рабіўся.

У залежнасці ад якасці зямлі В. падзяляліся на добрыя, сярэднія, кепскія і вусім кепскія. В. павінна была складацца з 33 маргоў, але пры кепскай зямлі практыкаваліся т. зв. «наддаўкі», і таму памер В. вагаўся ад 30 да 46 маргоў. В. ў 30 маргоў раўнялася 20 дзесяцінам — 21,36 *га*. Яна мусіла мець чатырохвугольную форму і падзяляцца на 3 роўныя



Івянец. Кансервавы завод.

кавалкі, што адпавядала 3-польнай сістэме земляробства, пры немагчымасці — паразалі т. зв. «маргованыя» В., разнастайныя па форме і без падзелу на 3 роўныя палі. В. былі і мерай феад. павіннасцей, у залежнасці ад умоў плацяжу адрозніваліся В. цяглыя (панщына), асадныя (грашовы чынш), вольныя (ад павіннасцей; даваліся службоўцам, вясковай адміністрацыі), пустыя (не ўзятыя ў карыстанне).

Літ.: Гл. пры арт. *Валочная памера.*

М. М. Улашчык. Масква.

ВАЛОКІ, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Падпарадкоўваецца Хойніцкаму гарсавету, непасрэдна прылягае да горада. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 110 *км* на ПдЗ ад Гомеля, 5 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 1185 ж., двароў 319 (1970).

ВАЛОКНЫ (у р а с л і н), элементы механічнай тканкі раслін. Складаюцца з прадаўгаватых таўстасценных клетак. Надаюць гнуткасць і трываласць раслінам, з'яўляюцца апорай тканак, якія праводзяць ваду і пажыўныя рэчывы. Развіваюцца ў лубе і каравой частцы сцябла (лубяныя валокны) або драўніне (драўнінныя валокны, ці лібрыформ). Лубяныя валокны некат. раслін (лёну, канапель, кенафу, рамі і інш.) выкарыстоўваюцца як тэкст. сыравіна. З лубяных валокнаў ліпы робяць лыка, мачалу, рагожу. Драўнінныя валокны пасля складаных мех. і хім. апрацовак выкарыстоўваюць таксама ў тэкст. вытворчасці (штучны шоўк).

Літ.: Гл. пры арт. *Анатомія раслін.*

ВАЛОКНЫ ТЭКСТЫЛЬНЫЯ (п р ы р о д н ы я), доўгія, трывалыя і гнуткія, з малымі напярочнымі памерамі целы раслінага, жывёльнага і мінер. паходжання; сыравіна для вытворчасці пражы і некат. пятканых вырабаў (валюшна-лямцавых, ватовых і інш.). Разам з *валокнамі хімічнымі* — аснова тэкст. прамысловасці. В. т. раслінага паходжання атрымліваюць з *лёну, канапель, бавоўны,* джуту, кенафу; жывёльнага — з шэрсці жывёл і шаўкавін, якія выдзяляе тутавы шаўкапрад; мінеральныя — з *азбесту.*

Валакно бавоўны найб. пашыранае і таннае. Даўж. бавоўняных В. т. пераважна 25—30 *мм*. Самыя каштоўныя В. т.— доўгія і тонкія, бо з іх можна рабіць тонкую пражу і тканіну (маркізет, батыст). Ільняныя В. т. робяць з лубяной часткі лёну. Маюць даўж. 100—800 *мм*. Яны больш цеплаправодныя за бавоўняныя, таму з іх выраблюць пражу на тканіны летняга сезону. Пругкасць ільняных В. т., як і бавоўняных, нізкая, яны надта камечацца. На 47 ільнозаводах Беларусі (1969) вырабляецца больш за ⅓ ільнавалакна ў СССР. Лубяныя В. т. з пянькі, кенафу, джуту ідуць на выраб канатаў, вяровак і гасп. тканін. Шарсцяныя В. т. выраблюцца з шэрсці авечак, коз, вярблюдаў, трусоў; даўж. яго 50—300 *мм*. Чым танчэйшая шэрсць, тым лепшая з яе тканіна. Шарсцяныя В. т. пругкія, вырабы з іх не камечацца. Шаўковыя В. т.— тонкія, вельмі пругкія ніткі; даўж. 400—1200 *м*. Вытворчасць шоўку працаёмкая; у тэкст. прамысловасці больш выкарыстоўваюць сінтэтычныя В. т., якія імітуюць ніткі натуральнага шоўку. Мінеральныя азбеставыя В. т. ідуць на тэхн. тканіны, ізаляцыйныя матэрыялы і некат. віды вогнеахоўнага адзення. Натуральныя В. т. ўжываюць асобна, а таксама разам з іншымі В. т., напр., бавоўняныя з капронавымі, ільняныя з лаўсанавымі. Гэта паляпшае якасць тканін, робіць іх вытворчасць больш танной, даваляе дамагацца пажаданых знешніх эфектаў. Вядомыя прадпры-

емствы перапрацоўкі бавоўны ў БССР — *Баранавіцкі бавоўняны камбінат* і *Гродзенская бавоўнапрадзільная фабрыка.*

Літ.: Кукин Г. Н. и Соловьев А. Н. Текстильное материаловедение, ч. 1—2, М., 1961—64.

С. В. Іваноў. Мінск.

ВАЛОКНЫ ХІМІЧНЫЯ, валокны, штучна выраблены на прамысл. прадпрыемствах з дапамогай фізіка-хімічных працэсаў (у адрозненне ад *валокнаў тэкстыльных*). В. х. падзяляюцца на штучныя, іх выпрацоўваюць з прыродных арган. палімераў (цэлюлозы, бялкоў) і з нізкамалекулярных неарган. злучэнняў (крэмнію і інш.), і сінтэтычныя — з сінтэзаваных палімераў.

Да штучных валокнаў з прыродных вугляводаў належаць: валокны з гідратцэлюлозы (*віскоза*, медна-амічнае, амыленае ацэтатнае валакно — фартызан), з ды- і трыацэтату (ацэтатнае валакно), з вытворных альгінавай к-ты (альгінавыя валокны); з прыродных поліамідаў (казеінавае, зеінавае і інш. валокны); з неарган. злучэнняў (*шкляное валакно*, базальтавае, металічнае і інш.). Да сінт. валокнаў належаць валокны з гетэра- і карбаланцуговых арган. злучэнняў (найлан, лаўсан, палітэн); з галагенавытворных вінілавых злучэнняў (хларын, тэфлон, фтарлон); з вытворных карбонавых к-т (нітрон, акрылан, вінілон) і інш. Хім. і фіз. ўласцівасці В. х. розныя: цэлюлозныя — нястойкія да дзеяння неарган. к-т, але больш устойлівыя да шчолачаў, бялковыя — наадварот. Сінт. валокны (асабліва фтор- і хлорсмяшчальныя) устойлівыя да дзеяння кіслот і шчолачаў, дрэнна праводзяць цеплыню і электрычнасць, пры награванні разбураюцца: цэлюлозныя валакно пры 160, бялковае пры 170, сінт. пры 300, шкляное пры 1200 °С.

В. х. маюць вялікае нар.-гасп. значэнне, вытворчасць іх з кожным годам павялічваецца. У БССР у 1969 выпушчана В. х. у 21 раз больш, чым у 1940; іх выраблюць *Магілёўскі камбінат сінтэтычнага валакна, Магілёўскі завод штучнага валакна, Свеглагорскі завод штучнага валакна, Полацкі завод шкловалакна.* У перспектыве ўвод у эксплуатацыю (1972) вытв. нітрону на Полацкім хім. камбінаце. БССР у 1969 выпусціла 9,4% В. х. ад агульнасаюзнай вытворчасці. Гл. таксама *Поліакрыланітрылавыя валокны, Поліамідныя валокны, Полівініласпіртавыя валокны, Полівінілхларыдныя валокны, Поліэфірныя валокны, Хімічная прамысловасць.*

Літ.: Роговин З. А. Основы химии и технологии производства химических волокон, 3 изд., т. 1—2, М.—Л., 1964—65; Соколов Г. В. Подготовка химических волокон к переработке в текстильной промышленности, М., 1968.

Д. У. Жаркоўскі. Мінск.

ВАЛОСАВА, вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 20 *км* на ПнЗ ад Талачына, 150 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Талачын. 327 ж., двароў 83 (1970). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. ўчастак, адда. сувязі, 3 магазіны.

ВАЛОСАВІЧЫ, вёска ў Акцябрскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Трэмля (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Фрунзе. За 22 *км* на ПдУ ад г. п. Акцябрскі, 185 *км* ад Гомеля, 25 *км* ад чыг. ст. Рабкор, на шашы Акцябрскі — Азарычы. 304 ж., двароў 89 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны. У Айч. вайну вёску спалілі нямецкія фашысты, загубілі 137 жыхароў.

ВАЛОЎКА, рака, левы прыток Нёмана. Даўж. 39 *км*. Цячэ ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл. Вадазбор (253 км²) у межах паўн.-ўсх. схілаў Навагрудскага ўзв. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,6 м³/сек.

ВАЛОЧНАЯ ПАМЕРА, комплекс аграрных мерапрыемстваў у Вял. кн. Літоўскім. Выкліканa развіццём прадукцыйных сіл, унутр. і знешняга рынку. Мела на мэце дакладны ўлік зямель, вызначэнне іх якасці, упарадкаванне павіннасцей, далейшае запрыгоньванне сялян, пашырэнне фальварачнай гасп., павелічэнне прыбыткаў казны і інш. У аснове В. п. ляжаў абмер зямель на стандартныя зямельныя ўчасткі — *валокі* (21,36 *га*). Першы абмер зямель на валокі зроблены ў 1552—55 у Пінскім і Клецкім кн. Пасля *«Уставы на валокі»* 1557 В. п. ажыццяўлялася ў вялікакняскіх, потым і ў прыватнаўласніцкіх маёнтках.

Плошча, якую мералі, павінна была мець форму чатырохвугольніка і падзялялася на 3 палі, на сярэднім размяшчалася вёска. Зводзячы сяляне у вёскі, урад стварaў новы адм. падзел: некалькі вёсак складалі *войтаўства* (300—400 валок ці прыблізна столькі ж гаспадарак), некалькі войтаўстваў — воласць. Улады намагаліся пасадзіць кожную сялянскую сям'ю на валоку, бо валока лічылася акладной адзінкай. Але апрацаваць 20—25 *га* зямлі адной сям'і было цяжка, таму валоку бралі 2, а то і 3 сям'і. *Цяглыя сяляне* у вялікакняскіх маёнтках у сярэдзіне 16 ст. адбывалі за валоку ў год 106 дзён паншчыны, плацілі грашовы чынш, давалі збожжа, агародніну, папраўлялі масты і дарогі, пастаўлялі вартаўнікоў, падводы. *Асадныя сяляне* у залежнасці ад якасці зямлі плацілі з валокі ад 66 да 106 грошаў у год. Цяжэйшыя былі павіннасці *агароднікаў*, якія за 1 морг зямлі (1/30 валокі) адбывалі 19 дзён паншчыны ў год. У час В. п. ліквідавалася цераспалосіца. Прыватнаўласніцкія землі, што знаходзіліся сярод вялікакняскіх, уключаліся ў іх склад, а ўладальнікі пры дакументальным доказе правоў атрымлівалі кампенсацыю ў інш. месцах. Намаганні ўрада пашырыць фальварковыя гасп. ў першыя гады В. п. поспеху не мелі, бо меркавалася ствараць фальваркі толькі вялікія і на зямлі добрай ці сярэдняй якасці. Для апрацоўкі валокі фальварковай зямлі вызначалася 7 сялянскіх гасп.

Ва Усх. Беларусі В. п. праводзілася з канца 16 да сярэдзіны 17 ст. Урад абмежаваўся абмерам зямлі, вызначэннем яе якасці і павіннасцей. Гэта тлумачылася ўмовамі Лівонскай вайны і менш развітымі прадукцыйнымі сіламі. В. п. ахапіла і дзярж. гарады, якія не атрымалі магдэбургскага права. Гараджане плацілі за валоку добрай зямлі 50 грошаў, сярэдняй — 40, дрэннай — 30. В. п. закранула і духавенства: царква ці касцёл у дзярж. маёнтку замест дзесятай часткі прыбыткаў атрымлівалі 1—2 валокі зямлі, вольнай ад павіннасцей. В. п. ўзмацніла запрыгоньванне сялян, павялічыла павіннасці, ліквідавала права пераходу, устанавіла кары за нявыхад на паншчыну, уводзіла падворнае землекарыстанне замест абшчыннага. Яна замацавала 3-польную сістэму земляробства, на многія стагоддзі вызначыла планаванне сялянскіх вёсак і сядзіб.

Літ.: Довнар-Запольский М. В. Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI в., Киев, 1905; Пичета В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве, 2 изд., М., 1957; Яго ж. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., М., 1961; Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв., Львов, 1957; Яго ж. Землеустройство и поземельный кадастр в Белоруссии, Литве и Украине в XVI—XVII вв., у кн.: Материалы по истории земледелия СССР, сб. 1, М., 1952.

М. М. Улашчык. Масква.

ВАЛОШЫН Андрэй Міхайлавіч [н. 1(14).9. 1906, в. Калюжанцы Канстанцінаградскага пав. Палтаўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1927. На фронце з ліп. 1941. Полк пад камандаваннем В. 24.6.1944 прарваў эшаліраваную абарону, выйшаў у тыл варожай групоўкі каля в. Зеляновічы і Зубарэвічы на ПдУ ад Глуска Мінскай вобл. Гэта памагло асн. часцям фарсіраваць Пціч і авалодаць Глускам. У баях з 24.6 да 2.7.1944 полк захапіў 6 танкаў і самаходных гармат, 30 гармат і мінамётаў, больш як 80 кулямётаў, 25 складаў, знішчыў і захапіў у палон звыш 1500 гітлераўцаў. Жыве ў Маскве.

ВАЛОШЫН Іван Піліпавіч [29.7(11.8).1903, ст. Аўдзеёўка Екацярынінскай чыгункі — 18.1. 1969], беларускі вучоны ў галіне энергетыкі, дзярж. дзеяч БССР. Д-р тэхн. н. (1965), праф. (1966). Чл. КПСС з 1926. У 1930 скончыў Маскоўскі энергетычны ін-т. У 1938—40 інструктар ЦК КП(б)Б; у 1940—51 нам. старшыні Саўнаркома БССР, нар. камісар, міністр БССР. У Вял. Айч. вайну нам. начальніка спецшколы па палітчастцы Бел. штаба партыз. руху. З 1951 кіраўнік энергасектара, потым ін-та энергетыкі АН БССР. Навук. працы ў галіне энергетыкі, распрацоўкі і ўкаранення паўправадніковых прылад. З 1949 да 1953 кандыдат у чл. ЦК КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Развитие энергетики Белоруссии, Мн., 1960; (разам з В. А. Палачыным) Переходные процессы в цепях с термисторами, Мн., 1967.

ВАЛОШЫН Мікалай Фёдаравіч (н. 19.8. 1923, в. Вял. Камышаваха Харкаўскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1949. На фронце з ліст. 1941. Вызначыўся 17.7.1944 у баях каля в. Медна Дамачоўскага р-на Брэсцкай вобл. 22.7.1944 увод пад камандаваннем В. фарсіраваў Зах. Буг, за паўтара сутак адбіў 10 варожых атак, утрымліваў плацдарм да падыходу асн. войск. Жыве ў Янкіеве Данецкай вобл.

ВАЛОШЫН Міхаіл Яўстафавіч (1920, в. Дзяпісаўка Міхайлаўскага пав. Акмолінскай вобл.— 31.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся пры вызваленні Віцебшчыны ў чэрв. 1944. Стралковы батальён пад камандаваннем В. прарваў абарону каля в. Мазурына, авалодаў г. п. Шуміліна і ст. Сіроціна, пад моцным агнём ворага фарсіраваў Зах. Дзвіну, замацаваўся на плацдарме і ў баях злучыўся з войскамі 3-га Бел. фронту, замкнуўшы акружэнне віцебскай варожай групоўкі. Загінуў пры вызваленні г. Біржай Літ. ССР.

ВАЛОШЫН Павел Пятровіч (1891, в. Гаркавічы Сакольскага пав. Гродзенскай губ.— 1937), дзеяч нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. З сялян. Працаваў паштовым службоўцам на Гродзеншчыне. У 1-ю сусв. вайну ў арміі. Належаў да партыі эсэраў, потым чл. Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, пасля расколу якой адзін з ініцыятараў стварэння Беларускай партыі незалежных сацыялістаў (студз. 1924). З 1922 пасол (дэпутат) польскага сейма, уваходзіў у рэвалюц.-дэмакр. крыло беларускай нац. фракцыі. Адзін з ініцыятараў расколу фракцыі і стварэння *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ, ліп. 1925), чл. Цэнтральнага камітэта БСРГ. 15.1.1927 з інш. кіраўнікамі БСРГ арыштаваны польскімі ўладамі і прыгавораны да 12 гадоў турмы (гл. *Працэс 56-ці*). Вызвалены ў выніку абмену паліт. зняволенымі паміж Польшчай і СССР. З 1932 жыў у Мінску.



Літ.: Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966.

ВАЛТОРНА (ням. Waldhorn літар. лясны рог), духавы мушткоўковы музычны інструмент. Паходзіць ад паляўнічага рога. Спачатку мела толькі гукі натуральнага гукараду; запаўненне прамежкаў паміж імі стала магчыма пасля вынаходства вентыляў (пач. 19 ст.). Дыяпазон сучаснай храматычнай В. H_1 — f^2. Гук мяккі, глыбокі. Аркестравы, ансамблевы і сольны інструмент.



ВАЛУЗНЕЎ Анатоль Рыгоравіч [н. 16(29). 10.1904, Мінск], беларускі савецкі селекцыянер-пладавод. Канд. с.-г. н. (1961). Скончыў Ленінградскі с.-г. ін-т (1927). З 1929 працаваў па сортавыпрабаванні агародніных культур у Бел. аддзяленні Усесаюзнага ін-та прыкладной батанікі і новых культур. У 1936 узначаліў навук. даследаванні па селекцыі ягадных культур на Бел. пладова-агародніннай доследнай станцыі (з 1956 Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы). Вывеў 25 сартоў ягадных культур, 14 раяніраваны ў БССР. Найб. вядомыя сарты: суніц — Лявоніха, Чайка, Мінская; чорных парэчак — Лошыцкая, Беларускія салодкія, Паўлінка, Золушка, Памяць Міная Шмырова; агрэсту — Яравы, Шчодры. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Смородина, Мн., 1951; Земляника садовая, Мн., 1953; (у саав.) Районированные и перспективные сорта плодовых и ягодных культур Белорусской ССР, Мн., 1960.

ВАЛУЙ, бычок (Russula foetens), шапкавы грыб сям. сыраежкавых. Шапка да 15 *см* у дыяметры, жаўтаватая або жоўта-бурая; у маладых клейкая, шарападобная, у старых

плоска-распасцёртая. Пласцінкі белыя, потым робяцца жаўтаватыя. Ножка белаватая, цыліндрычная, часам з патаўшчэннем. Мякаць едкая, з непрыемным пахам. Расце В. у мяшаных і хвойных лясах у лішэні — верасні. Ніякалясны ядомы грыб. Спажываецца салены і марынаваны (пасля вымачкі і варкі). У некат. раёнах БССР лічыцца за атрутны. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Грыбы*.

Літ.: Гл. пры арт. *Грыбы*.

ВАЛУЙСКАЕ, возера ў бас. р. Нешчарды, правага прытока Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Вадазбор (24,7 *км*²) узгорыста-марэнны. Воз. праточнае, зарастае. Водзяцца плотка, акунь, шчупак і інш.

ВАЛУНЫ, акругленыя абломкі горных парод памерамі больш за 10 *см*. Абломкі больш за 1 *м* наз. таксама глыбамі. На тэр. БССР памеры В. пераважна 0,1—0,7 *м*.

Утвараюцца пры выветрыванні горных парод і апрацоўцы абломкаў водным патокам ці ледавіком. У горных і перадгорных раёнах пашыраны В. рачнога (алювіяльнага) паходжання або В. непастаянных водных (селевых) патокаў (пралювіяльныя), дзе яны ўсцілаюць днішча далінаў і ўтвараюць валунныя палі (шлейфы) у дольтах. У абласцях стараж. мацерыковага абледзянення (напр., на Беларусі) пашыраны В. ледавіковага паходжання. Разам з гліпамі, суглінкамі, супескамі, пяскамі і жвірам яны складаюць донную марэну ледавіка, уваходзяць у склад канечных марэн. Пры размыве ледавіковых адкладаў В. астаюцца на паверхні. Паводле саставу яны найчасцей адрозніваюцца ад мясцовых горных парод, бо прынесены ледавіком здалёк (на Беларусь — з Скандынавіі, Фінляндыі, Карэліі). Перанесеныя на вялікія адлегласці В. называюцца эратычнымі (вандроўнымі).

На Беларусі В. пашыраны ў цэнтр. і паўн. частках (Беларуская града, Паазер'е і інш.), займаюць у некат. мясцінах да 10—25% паверхні і перашкаджаюць апрацоўваць глебу. Пераважны састаў — гнейсы, граніты, радзей даламіты, вапнякі, кварцыты і інш. Найб. вялікія В. запаведныя («Вялікі камень» у Бешанковіцкім р-не каля в. Горкі даўж. 11 *м*, шыр. 5,6 *м*, выш. 2,8 *м*). Выкарыстоўваюцца на брук, шчэбень, як бутавы камень. З вапняковых і даламітавых выпальваюць вапну.

Літ.: Шевяков Б. В. О валунно-галечном камне Белоруссии. «Труды Ин-та геологических наук АН БССР», 1958, в. 1. *У. І. Шкуратаў*. Мінск.

ВАЛХВА, рака, правы прыток р. Случы (бас. Прыпяці). Даўж. 39 *км*. Цячэ па тэр. Прыпяцкага Палесся, у Салігорскім, Жыткавіцкім і Лунінецкім р-нах Мінскай, Гомельскай і Брэсцкай абл. Перасякаецца каналамі: у верхняй ч. Дзвінскім, у сярэдняй Галоўным. Вадазбор (404 *км*²): у вярхоўі водналедавіковая, у сярэднім і ніжнім цячэнні азёрна-ледавіковая і азёрна-балотная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,7 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік пры асушэнні балотаў. На В.— рабочы пас. Мікашэвічы.

ВАЛЧАНЕЦКАЯ Валянціна Фёдараўна [н. 27.11(9.12).1898, Ніжні Ноўгарад], беларуская савецкая спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. БССР (1955). Чл. КПСС з 1947. Вучылася ў Маск. кансерваторыі (1917—20). Дэбютавала ў Смаленску (1920), спявала ў оперных т-рах Тыфліса, Саратава, Баку і інш. У 1940—57 салістка Бел. т-ра оперы і балета. З партый, выкананых на розных сцэнах: Любаша («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Марфа («Хаваншчына» М. Мусаргскага), Графіня («Пікавая дама» П. Чайкоўскага), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ), Амнерыс («Аіда» Дж. Вердзі), Ганка, Агата («Міхась Падгорны» і «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага), Марыя Грагатовіч («Кастусь Каліноўскі»





В. Ф. Валчанецкая ў ролі Графіні ў сцэне з оперы «Пікавая дама».

Дз. Лукаса), Сцепаніда («Надзея Дурава» А. Багатырова). В. уласцівыя тонкасць муз. і сцэнічнай інтэрпрэтацыі оперная матэрыялу, уменне ствараць выразныя характары.

Літ.: Смольскі Б. Майстар музычнай сцэны, Мн., 1960. *І. Г. Нісневіч*. Мінск.

ВАЛЧКОЎ Іван Мікітавіч [17(30).8.1910, с. Вялікае Пічаева Маршанскага пав. Тамбоўскай губ.— 14.7.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС. На фронце з 1941. Вызначыўся ў баях на тэр. Браслаўскага р-на Вілейскай вобл. У ліп. 1944 пры авалоданні в. Пустошкі пад моцным агнём ворага падняў у атаку роту, якая вяла 6 гадзін няроўны бой з ворагам і выбіла яго з вёскі. Каля в. Плюсы ўтрымліваў вышыню, якую гітлераўцы нераз контратакавалі пры падтрымцы танкаў. Загінуў у гэтым баі. Імем В. названы вуліца і плошча на радзіме.

ВАЛЧОК Лавар Якаўлевіч [н. 9(22).11.1903, в. Цёсава Слуцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне цеплафізікі.

Д-р тэхн. н. (1967), праф. (1968). Заг. кафедры рухавікоў унутр. згарання Бел. політэхн. ін-та. Скончыў БДУ (1926) і Ленінградскі політэхн. ін-т (1930). Навук. працы пра абгрунтаванне і стварэнне методыкі эксперым. даследавання рухавікоў унутр. згарання. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Электрические методы измерений в двигателях внутреннего сгорания, М.— Л., 1948; Методы измерений в двигателях внутреннего сгорания, М.— Л., 1955.

ВАЛЧЭЦКАЯ Алена Уладзіміраўна (н. 4.12.1943, Гродна), беларуская спартсменка, заел. майстар спорту СССР (1964). Скончыла Гродзенскі пед. ін-т. З 1958 да 1965 чэмпіёнка БССР па спарт. гімнастыцы, 6 разоў абс. чэмпіёнка рэспублікі. У 1961—65 чэмпіёнка СССР па асобных відах спарт. гімнастыкі (апорныя скачкі і гімнастычнае бервяно). На XVIII Алімп. гульнях у Токіо заваявала залаты медаль у камандным заліку ў складзе каманды Сав. Саюза. Выкладчыца фіз. выхавання Гродзенскага тэхнікума фіз. культуры.

ВАЛЫНАЎ Барыс Валянцінавіч (н. 18.12.1934, г. Іркуцк), лётчык-касманаўт СССР. Герой Сав. Саюза, палкоўнік. Чл. КПСС з 1958. Скончыў Валгаградскае ваен. авіяц. вучылішча. З 1956 у Сав. Арміі, з 1960 у атрадзе касманаўтаў. У 1968 скончыў Ваенна-паветр. інж. акадэмію імя Жукоўскага. Камандзір карабля «Саюз-5» (гл. *«Саюз»*), выведзенага на арбіту для сустрэчы з караблём «Саюз-4». З А. С. *Елісеевым* і Я. В. *Хрунovым* ажыццявіў палёт у космас 15—18.1.1969. З У. А. *Шаталавым*, які пілатаваў «Саюз-4», правёў збліжэнне і стыкоўку караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5», што забяспечыла Елісееву і Хрунову пераход праз адкрыты космас у карабель «Саюз-4». В. прабыў у космасе больш за 72 *гада*, праляцеў 2 млн. *км*, зрабіў 50 абаротаў вакол Зямлі. Узнагароджаны ордэнам Леніна.



Літ.: Каманин Н. П. и Ребров М. Ф. Экспериментальная космическая станция на орбите. М., 1969.

ВАЛЫНЕЦ Андрэй Іванавіч [6(19).1.1904, в. Жаўткі Вілейскага пав. Віленскай губ.— 30.3.1965], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1934. Удзельнік рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. У 1935—39 у турме для паліт. зняволеных у Вільні. Напярэдадні вайны дырэктар торфапрадпрыемства. У перыяд ням.-фаш. акупацыі арганізаваў партыз. дыверсійную групу, якая да вер. 1943 выросла ў атрад да 300 чал. Пад кіраўніцтвам В. ў Вілейскім, Смаргонскім, Маладзечанскім р-нах створана шырокая сетка антыфаш. падпольных арг-цый. У чэрв. 1944 атрад рэарганізаваны ў *партызанскую брыгаду «За Савецкую Беларусь»*, камандзірам якой быў В. Пасля вызвалення Беларусі на парт. і сав. рабоце.




ВАЛЫНЕЦ Флягонт Ігнатавіч [27.12.1878 (8.1.1879), г. Вілейка — 9.10.1941], удзельнік рэвалюц. і нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. З беззямельных сялян. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1897), настаўнічаў на Вілейшчыне. За ўдзел у рэвалюцыі 1905—07 пазбаўлены права выкладання. Пасля Кастр. рэвалюцыі камісар Вілейскага рэўкома. У час акупацыі Беларусі кайзераўскімі войскамі ствараў на Вілейшчыне падпольныя камуніст. ячэйкі. Летам 1920 старшыня Вілейскага рэўкома. Увосень 1920 арыштаваны польск. акупантамі, да 1921 вязень кракаўскай турмы. У 1925—26 чл. Вілейскага павятовага к-та БСРГ, у 1927—29 узначальваў Вілейскую акруг. ўправу Т-ва бел. школы (ТБШ), з снеж. 1927 чл. галоўнай управы ТБШ. У 1928 выбраны дэпутатам польскага сейма. Адзін з кіраўнікоў рэвалюц.-вызв. арг-цыі *«Змаганне»*. 30.8.1930 арыштаваны польск. ўладамі, вясной 1931 зняволены на 8 гадоў. У выніку абмену палітзняволенымі ў 1932 пераехаў у Мінск, працаваў у паркамаце камунальнай гаспадаркі БССР. *Г. А. Каханоўскі*. Маладзечна.

ВАЛЫНКА, гл. *Дуда*.

ВАЛЫНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Украінскай ССР. Утворана 4.12.1939. Пл. 20,2 тыс. *км*². Нас. 975 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 15 раёнаў; 10 гарадоў, 21 гар. пас. Цэнтр г. Луцк.

Паўн. частку вобл. (¾ тэр.) займае раўнінная Палеская нізіна; цэнтральную перасякае Валынская града выш. да 220 *м*. На Пд у межы В. в. заходзіць хвалістае Валынскае ўзв. Карысныя выкапні: каменны вугаль (на ПдЗ, частка Львоўскага Валынскага кам.-вуг. басейна), торф, мел, гліна, пясок, вапнякі. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —4, —5, ліп. 18, 19 °С. Ападкаў 550—600 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Асн. рэкі: Прыпяць з прытокамі Стыр, Стадзён. Асн. рэкі: Прыпяць з прытокамі Стыр, Стаход, Тур'я, Выжаўка. Па мяжы з Польшчай Буг. Амаль усе рэкі мнагаводныя, выкарыстоўваюцца для меліярацыі, часткова суднаходныя. 226 азёраў агульнай пл. 14 тыс. *га* (найбольшыя Свіцязь, Пулямецкае, Турскае). Глебы ў паўн. частцы вобл. дзярнова-падзолістыя, дзярновыя і балотныя; у паўд. лесастэпавай — ападзоленыя, цёмна-шэрыя і шэрыя чарназемы, месцамі чарназёмныя. Пад лесам і хмызнякамі каля 29% тэрыторыі, 90% лесу размешчана ў паўн. палескай частцы. Пераважаюць хваёвыя бары і дубова-хваёвыя субары. У паўд. частцы невял. масівы дубова-грабовых лясоў. Больш за 10% тэр. пад забалочанымі лугамі і балотамі. Асн. насельніцтва — украінцы. Жывуць рускія, беларусы і інш. Сярэдняя шчыльн. 48,3 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 32%



(1970). Самыя вялікія гарады: Луцк (94 тыс. ж., 1970), Новавалынск, Ковель, Уладзімір-Валынскі.

Аб'ём валавой прадукцыі прамысл. павялічыўся ў 1968 у параўнанні з 1940 у 12,4 раза. Найб. развіты харчовая, паліўная, маш.-буд., металаапр. і дрэваапр. прамысловасць. 1-е месца па аб'ёме валавой прадукцыі належыць харч. прамысл. [Уладзімір-Валынскі і Іванічаўскі цукр. з-ды, Гарохаўскі і Гнедаўскі (у Луцку) цукр. камбінаты, Луцкі, Новавалынскі і Ковельскі мясакамбінаты, некалькі малаказаводаў]. Паліўная прамысл. (9 кам.-вуг. шахтаў на ПдЗ, торфапрадпрыемствы). Машынабудаванне і металаапрацоўка ў Луцку (аўтамабільны, прыладабудаўнічы, электраапаратны з-ды), Рожышчы (рамонтны з-д), Новавалынску (з-д для рамонту горнага абсталявання і з-д жалезабетонных вырабаў), Ківерцах (механічны і рамонтны з-ды). Дрэваапр. прамысл. вырабляе піламатэрыялы, паркет, мэблю. Прадпр. ў Цумані, Ківерцах, Ковелі, Луцку, Уладзімір-Валынскім, Маневічах. Развіта прамысл. буд. м. Швейная, абутковая, ільноапр. прамысловасць. Асн. цэнтры Луцк, Ковель, Уладзімір-Валынскі. У Новавалынску бавоўнапрадзільная ф-ка. Па тэр. вобласці праходзіць газаправод Дашава — Мінск. С. гасп. збожжа-буракаводчага і льнобульбянога кірунку. У 1970 у В. в. 357 калгасаў і 19 саўгасаў. Пасяўная пл. 693,4 тыс. *га* (1969), у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 289,5 тыс. *га*. Асн. збожжавая культура пшаніца (40% пасеваў збожжавых). Сеюць ячмень, грэчку, кукурузу. Пад цукр. буракамі (тыс. *га*) 44,05, лёнам-даўгунцом 27,3, бульбай 98,2, агародніна 8,8, кармавымі 217,9. Жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. На пач. 1970 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 664,4 (у т. л. кароў 310,4), свіней 429,6, авечак і коз 110,1. Даўж. чыгунак 582 км (1969). Найбуйнейшыя чыг. вузлы Ковель і Ківерцы. Гал. чыг. лініі Кіеў — Брэст, Люблін — Ковель — Сарны — Кіеў, Ківерцы — Луцк — Львоў. Аўтамаб. дарог з цвёрдым пакрыццём 1604 *км*. У В. в. пед. ін-т, агульнатэхн. ф-ты Львоўскага політэхн. ін-та і Кіеўскага аўтадарожнага ін-та; 18 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Абласны муз.-драм. тэатр у Луцку, Валынскі краязнаўчы музей, музей-сядзіба Лесі Украінкі ў в. Каладзяжнае. Абл. газета «Радянська Волинь».

Літ.: Корецький Л. М. Волинська область, Київ, 1960. *А. І. Кансевіч.* Кіеў.

ВАЛЫНСКАЯ ЗЯМЛЯ (Валынь), старажытнаруская гістар. вобласць у бас. верхняга цячэння Зах. Буга і Прыпяці з яе правымі прытокамі. У 8—9 ст. на В. з. жылі *валыняне* і *бужане*. Назву атрымала ад г. Валыні (Вялыні). У канцы 10 ст. ўвайшла ў склад Кіеўскай Русі.

Першым князем з дынастыі Рурыкавічаў быў Усевалад, сын Уладзіміра Святаславіча. З 10 ст. на В. з. ўзнікаюць гарады Уладзімір, Луцк, Холм, Белз, Бужск, Турыйск, Чартарыйск, Ратна, Астрог і інш. У сярэдзіне 12 ст. адасабляецца ад Кіева. У барацьбе з буйнымі феадаламі ўладзімір-валынскаму князю Раману Мсціславічу ўдалося ўмацаваць княскую ўладу і аб'яднаць удзельныя княствы, а ў 1199 падначаліць Галіцкае княства. З сярэдзіны 12 ст. пад уладай валынскіх князёў знаходзілася *Берасцейская зямля*. У канцы 1240 мангола-татары разрабавалі і спустошылі многія гарады В. з. Неўзабаве Валынь трапіла ў залежнасць ад Залатой Арды. У 1-й пал. 14 ст. В. з. трапіла пад уладу літ. князёў.

У сярэдзіне 14 ст. пачалася барацьба паміж Польшчай, Венгрыяй і Вял. кн. Літ. за Валынь і Галіччыну; Польшча захапіла Галіцкія землі (1349) і Зах. Валынь з г. Холмам і Белзам (1377). У 1340—82 на Валыні княжыў Любарт, сын Гедыміна; з 80-х г. 14 ст. пад уладай Вітаўта, потым Свідрыгайлы. Вял. князі літоўскія далі В. з. ўстаўныя граматы (каля 1427, у 1501, 1509), якія вызначалі яе ўнутраную будову, абаранялі правы і прывілеі валынскай шляхты. Паводле *Люблінскай уніі 1569* В. з. далучана да Польшчы ў складзе Валынскага ваяводства; у выніку другога (1793) і трэцяга (1795) падзелаў Польшчы Валынь уз'яднана з Расіяй.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т.2 — Ипатьевская летопись, М., 1962; Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси, М., 1950; Андриашев А. М. Очерк истории Волынской земли до конца XIV ст., Киев, 1887; Грушевський М. Історія України — Руси, т. 4, 2 вид., Київ — Львів, 1907. *С. А. Шчарбакоў.* Мінск.

ВАЛЫНСКАЯ МЕГАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА, культура мегалітычных пляменаў (канец 3 — пач. 2-га тысячагоддзя да н. э.), якія жылі на правых прытоках Прыпяці — Стыры, Гарыні і інш. Вядома па пахаваннях у дальменах або каменных скрынях з трупаспаленнем і трупапалажэннем; пахаванні парныя і сямейныя. Пры раскопках выяўлены шарападобныя амфары, пласкадонныя гаршкі і міскі, свідраваныя сякеры, крамянёвыя нажы, сярпы і скрабкі, упрыгожанні з медзі. Насельніцтва займалася жывёлагадоўляй і земляробствам. Існавала патрыярхальнае рабства. Гл. таксама *Шарападобных амфар культура*.

ВАЛЫНСКАЯ СЕРЫЯ, адклады ніжняй часткі *вендскага комплексу* верхняга пратэразою на захадзе Рускай платформы. Тэрмін прапанаваны сав. геолагам Л. П. Брунс у 1957. Адклады В. с. магутнасцю да 400 *м* пашыраны на Беларусі. Складзены ў ніжняй ч. в розназярністых пясчаных парод (*гарбашэўская світа*), у верхняй — з вулканічных туфаў, туфітаў і вулканагенна-асадкавых парод (*бераставецкі гарызонт*). На ПдЗ Беларусі (Брэсцкая вобл.) у разрэзе В. с. эфузіўныя пароды асноўнага і сярэдняга саставу і іх туфы. Найб. характэрныя разрэзы вывучаны ў Брэсце, Клецку, Століне і інш. У валынскі час на тэр. БССР і сумежных раёнаў УССР і ПНР адбывалася інтэнс. вулкан. дзейнасць.

ВАЛЫНЦЫ, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на р. Дрыса. Цэнтр сельсавета і калгаса імя XXII парта'езду. За 20 *км* на ПдУ ад Верхнядзвінска, 150 *км* ад Віцебска, 4 *км* ад чыг. раз'езда Беніслаўскага. 681 ж., гасп. 252 (1970). Буд.-мантажнае ўпраўленне меліярацыі, аддз. масласырзавода. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, сталовая, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. У 1-й пал. 19 ст. тут жыў і вучыўся ў т. зв. Забельскай гімназіі бел. пісьменнік і рэвалюцыянер А. *Вярыга-Дарэўскі*.

ВАЛЫНЦЫ, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл., на р. Кляпінка. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Валынцы». За 20 *км* на ПнУ ад г. п. Карма, 130 *км* ад Гомеля, 76 *км* ад чыг. ст. Рагачоў. 535 ж., гасп. 168 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі нямецкія фашысты. Брацкая магіла 166 сав. воінаў і партызанаў, помнік сав. воінам.

ВАЛЫНЬ, Вялынь, старажытнарускі горад на беразе Зах. Буга. Існаваў з 9 ст., магчыма і раней. Упершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 990. Спачатку цэнтр *валынян*, потым гал. горад *Валынскай зямлі*. У 11 ст. страціў значэнне. У 2-й палове 12 ст. летапісныя звесткі пра В. спыняюцца.

ВАЛЫНЯНЕ, валыняне, усх. славяне, якія ў 9—11 ст. жылі ў вярхоўях бас. Зах. Буга і каля вытокаў Прыпяці (тэр. Валыні). У 7 ст. тут жылі *дулебы*. Археал. раскопкамі высветлена, што В. з стараж. часоў жылі асела, займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, лясны мі промыслам і. Паводле звестак географа Баварскага, у канцы 9 ст. В. (Velunzani) мелі 70 гарадоў (замкаў). Араб. географ аль-Масудзі паведамляў у 2-й палове 10 ст. пра плямёны «валінана» і «дулаба», якія ў гістар. л-ры прынята лічыць В. і дулебамі. У 10 ст. на тэр. В. існавала *Уладзіміра-Валынскае княства*, якое ў канцы 12 — пач. 13 ст. дасягнула найб. магутнасці, мела ўплыў на Галіцкае і Берасцейскае княствы.

Літ.: Андриашев А. М. Очерк истории Волынской земли до конца XIV ст., Киев, 1887; Третьяков П. Н. Восточнославянские племена, 2 изд., М., 1953; Шахматов А. А. Древнейшие судьбы русского племени, П., 1919.

ВАЛЬБЕРХ Іван Іванавіч [3(14).7.1766—4(16).7.1819], рускі балетмайстар. З 1786 саліст пецярбургскай прыдворнай трупы. Паставіў каля 40 спектакляў, у якіх сцвярджаў прынцып дзейснага, выразнага танца. Узбагаціў балет ідэямі сентыменталізму («Новы Вертэр» С. Цітова, 1799). Аўтар балетаў на рус. сюжэты («Жанчына-казак» на муз. розных кампазітараў, 1810), патрыят. дывертысментаў. У 1800 у Шклове адабраў для пецярбургскіх імператарскіх т-раў 14 танцоўшчыкаў з прыгоннай трупы С. Зорыча (К. Буткевіча, К. Азарэвічаву, Я. Палітыку і інш.), займаў іх у сваіх пастаноўках.

Тв.: Из архива балетмейстера.., М.— Л., 1948.

ВАЛЬВАЦЕНКА Іван Кірылавіч [н. 15(28).4.1915, в. Мазалава Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ.], Герой Сав. Саюза (1944). З сял. Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1937. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на фронце з чэрв. 1941. Удзельнік абароны Львова, Масквы, баёў на Курскай дузе, Берлінскай і Пражскай аперацый. Вызначыўся ў баях каля Кіева. 5—6.11.1943 танкавая рота на чале з В. прарвала моцную абарону ворага і перарэзала шашу Кіеў — Жытомір. Калі танк быў падбіты, паранены В. не пакідаў поля бою да падыходу дапамогі; экіпаж танка знішчыў 2 варожыя танкі, 9 цяжкіх гармат, 17 аўтамашын. Жыве ў Львове.



ВАЛЬДШНЭП, гл. *Слонка*.

ВАЛЬДЭНАЎСКАЕ ПЕРАТВАРЭННЕ, з'ява пераатварэння аднаго актыўнага рэчыва ў другое, процілегла вярчальнае, актыўнага рэчыва. Выкарыстоўваецца для вывучэння механізму рэакцый і для атрымання новых актыўных рэчываў. Гл. таксама *Стэрэахімія*, *Актыўная актыўнасць*.

Літ.: Темникова Т. И. Курс теоретических основ органической химии, 3 изд., Л., 1968, с. 314—348.

ВАЛЬЕ ІНКЛАН (Válle-Inclán) Рамон Марыя дэль (28.10.1869, Галісія — 5.1.1936), іспанскі пісьменнік. Літ. дзейнасць пачаў у 1894. Аўтар трылогій «Варварскія камедыі» (1907—22) і «Карлісцкая вайна» (1908—09). Выступаў супраць абсалютызму, ваенна-фаш. дыктатуры і клерыкалізму (публіцыст. навелы «Аўторак карнавалу», 1924—26; сатыр. раман-памфлет «Тыран Бандэрас», 1926). Старшыня ісп. «Таварыства сяброў СССР» (1933).

Тв.: Рус. пер.— Тиран Бандерас, М.—Л., 1959; Сонаты. Записки маркиза де Брадомина, М.—Л., 1966; Избранное, Л., 1969.

ВАЛЬКІ, вёска ў Віцебскім р-не, на р. Чарніца. Падпарадкоўваецца Янавіцкаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр калгаса імя Дзімітрова. За 40 *км* на ПнУ ад Віцебска, 28 *км* ад

чыг. ст. Лёзна. 276 ж., двароў 86 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі ням. фашысты.

ВАЛЬКОЎСКАЕ, возера ў бас. р. Чарпеніцы, левага прытока Нішчы (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,9 *км*². Даўж. 5 *км*, найбольшая шыр. 1 *км*, слрэдняя 0,6 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (309 *км*²) узгорыста-марэнны. Праз воз. працякае р. Чарпеніца. Слаба зарастае. Водзяцца лешч, плотка, шчупак, акунь, судак і інш.

ВАЛЬС (франц. valse ад ням. walzen тут — кружыцца), парны бальны танец, заснаваны на плаўным кружэнні. Тэмп хуткі ці ўмерана хуткі, муз. памер ³/₄. Узнік у канцы 18 ст. на аснове аўстр., паўд.-ням., чэш. нар. танцаў. У 19 ст. пашырыўся ў Еўропе. Найвышэйшы росквіт звязаны з імёнамі І. Ланера, І. Штраўса-бацькі і І. Штраўса-сына — стваральнікаў канцэртна-цыклічнай формы В. (т. зв. венскі вальс). Дзякуючы лірызму, рамант. палётнасці набыў самастойнае значэнне ў фп., арк. музыцы, стаў асновай многіх рамансаў, арыі і інш.

ВАЛЬТМЕТР, прылада для вымярэння напружання паміж двума пунктамі электрычнага ланцуга. Уключаецца паралельна прыёмніку энергіі. Унутр. супраціўленне вялікае. Бываюць В. наступных вымяральных сістэм: магнітаэлектрычнай (вымяраюць напружанне ў ланцугах пастаяннага току); электрамагнітнай, электрадынамічнай, цеплавой (напружанне ў ланцугах пераменнага току); электрастатычнай (высокае напружанне пераменнага току) і электронай (лямпавыя В. для вымярэння напружання высокай частаты). Ужываюцца вярчальныя В., пабудаваныя на прынцыпе параметрычных ёмістых эл. машын, якія ператвараюць мех. энергію ў электрычную зменай ёмістасці. На Беларусі В. выпускае Віцебскі завод электравымяральных прылад.

ВАЛЬТЫЖЫРОЎКА (ад франц. voltiger пырхаць, лётаць), цыркавы жанр. Падзяляецца на гімнастычную (пералёт з адной трапецыі на другую), акрабатычную і В. на кані.

ВАЛЬТЭР (Voltaire) [псеўд.; сапр. імя Францыа Мары Аруэ; 21.11.1694, Парыж — 30.5.1778], французскі пісьменнік, публіцыст і філосаф, адзін з прадстаўнікоў французскага Асветніцтва. З сям'і натарыуса. За вальнадумства двойчы зняволены ў Бастылію (1717 і 1725). З-за праследаванняў большую частку жыцця правёў па-за Францыяй. Актыўны супрацоўнік «Энцыклапедыі». Памёр у Парыжы. Грамадска-паліт. вучэнне В. з'яўлялася ідэалогіяй франц. буржуазіі і мела ярка акрэсленую антыфеад. накіраванасць. У «Філасофскіх (або англійскіх) пісьмах» (1733), «Нарысе пра норавы і дух народаў» (1756) і інш. творах патрабаваў адмены феад. павіннасцей і ліквідацыі саслоўных прывілеяў дваранства і духавенства, выступаў за роўнасць грамадзян перад законам і бурж.-дэмакр. свабоды. Разам са спачуваннем да пакут эксплуатаванага феадаламі народа ў В. выяўляўся і страх перад ім. Лічыў падзел грамадства на багатых і бедных непазбежным, прыватную ўласнасць вечнай, а бурж. парадкі адзіна магчымымі і разумнымі. Паліт. ідэалам В. была канстытуцыйная манархія на чале з асвечаным манархам. Пад канец жыцця аддаваў перавагу рэсп. форме кіравання перад манархічнай. Нястомна змагаўся з артадаксальнымі формамі рэлігіі, лічыў царк. арганізацыю і рэліг. забабоны гал. ворагам чалавечага розуму і прагрэсу. У барацьбе супраць каталіцызму як гал. ідэйнай апоры феад.-абсалютысцкага ладу смела выставіў славуты лозунг «Задушыце гадзіну!». Але В. не здолеў падняцца да атэізму і лічыў, што рэфармаваная рэлігія павінна іспаваць як сродак утаймавання народу («чэрні»). Філас. вучэнне В., выкладзенае ў «Трактаце пра метафізіку» (1734), «Асновах філасофіі Ньютана» (1738), «Філасофскім слоўніку» (1764—68) і інш. творах, супярэчлівае. У рамках *дэізму* даваў матэрыялісц. тлумачэнне найбольш важных з'яў прыроды і патрабаваў навук. даследавання ўсеагульнай заканамернасці ў ёй, адхіляў ідэаліст. філасофію і рэзка крытыкаваў сярэдневяковую схаластыку, прапагандаваў у Францыі фізіку І. Ньютана і матэрыялісц. сенсуалізм Дж. Лока, але прызнаваў існаванне бога як «першага рухавіка», «вялікага геометра», які надаў матэрыі рух і надзяліў яе адольнасцю мыслення. У тэорыі пазнання крытыкаваў вучэнне аб прыроджаных ідэях і з пазіцый сенсуалізму Лока выступаў за эксперым. даследаванне прыроды. У аснове гістар.-сацыялагічнай канцэпцыі В. ляжыць ідэя прагрэс. развіцця грамадства. Але ход гісторыі ён тлумачыў барацьбой дабра і зла, адукацыі і невуцтва, развіццём і зменай ідэй. У «Гісторыі Расіі пры Пятры Вялікім» (1759—63) даў высокую ацэнку пятроўскім рэформам. Каб распаўсюдзіць асветніцкія ідэі, выкрыць царк. і феад. парадкі, шырока карыстаўся рознымі жанрамі маст. літаратуры: філас. аповесці («Кандыд, або Аптымізм», 1759; «Прастадушны», 1767), паэмы («Арлеанская нявінніца», 1735), трагедыі («Брут», 1731; «Заіра», паст. 1732; «Фанатызм, або Магамет», 1742, і інш.). У літ. дзейнасці прытрымліваўся эстэтыкі асветніцкага класіцызму. Творы В. шырока распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе. На Беларусі і ў Літве яны пашыраюцца з сярэдзіны 18 ст. ў франц. арыгіналах і ў перакладах на польск. і рус. мовы. У 1776 у Гродне на польск. мове выдадзена філас. аповесць В. «Задыг, або Лёс» пад назвай «Усходняя гісторыя пра Задыга», у якой з'едліва высмеяны саслоўныя забабоны дваранства і рэліг. нецярпімасць. У 1793 у Вільні выйшаў у перакладзе на польск. мову адзін з найбольш вядомых гістар. твораў В. «Век Людовіка XIV» (т. 1—2), у якім эканам. заняпад Францыі тлумачыцца рэліг. звадамі і захопніцкімі войнамі. У тэатрах Вільні, Нясвіжа і



інш. гарадоў ставіліся п'есы В. Вялікая цікавасць да літ. і філас. творчасці В. на Беларусі і ў Літве тлумачыцца тым, што ён напісаў некалькі брашур, у якіх рэзка крытыкаваў рэліг. фанатызм каталіцкай царквы, якая панавала ў Рэчы Паспалітай, бязлітасна выкрываў жорсткія праследаванні пратэстантаў і праваслаўных. Папулярнасць твораў і прапаганда ідэй В. прагрэс. прадстаўнікамі грамадскай думкі (К. Багуслаўскім, Ф. *Галянскім*, І. *Лялевелем*, *філаматамі* і інш.) былі прычынай лютых нападак на яго феад. і клерыкальнай рэакцыі. У 1781 у Нясвіжы выйшла кніга «Жыццё і памылкі Вальтэра» — скарочаны пераклад з франц. мовы на польскую ўхвалёнага рымскім папам Кліментам XIII паклёпніцкага твора вядомага праціўніка В. абата Клода Нанота «Памылкі Вальтэра». Аналагічны характар мела выдадзеная ў 1786 у Вільні кніга праф. багаслоўя з Жэневы Жана Вернэ «Філосаф без рэлігіі...» (т. 1—2). Магілёўскі архіепіскап Г. *Канісі* выступіў супраць антыклерыкальнага твора, які пад назвай «Пісьмо Вальтэра» распаўсюджваўся на Беларусі ў 2-й пал. 18 ст.

Тв.: Рус. пер.— Мемуары и памфлеты. Политика, религия, мораль, Л., 1924; Избранные произведения по уголовному праву и процессу, М., 1956; Философские повести, М., 1960; Бог и люди. Статьи, памфлеты и письма, т. 1—2, М., 1961.

Літ.: Державин К. Н. Вольтер, М., 1946; Вольтер. Статьи и материалы, М.—Л., 1948; Кузнецов В. Н. Вольтер и философия французского просвещения XVIII в., М., 1965; Библиотека Вольтера. Каталог книг, М.—Л., 1961.

А. А. Бірала. Мінск.

ВАЛЬТЭР (Walter) Бруна (сапр. Бруна Вальтэр Шлезінгер; 15.9.1876, Берлін — 17.2.1962), нямецкі дырыжор, музычны пісьменнік. Муз. кіраўнік оперных т-раў Мюнхена, Берліна, Вены, аркестра Гевандгаўза ў Лейпцызе. Эмігрыраваў з фаш. Германіі, з 1939 жыў у ЗША. Славуты інтэрпрэтатар ням. і аўстр. класікі, асабліва твораў В. Моцарта і Г. Малера. Гастраліраваў у СССР. Аўтар 2 сімфоній, некалькіх кніг, у т. л. пра Малера, Моцарта.

Тв.: Рус. пер.— Тема с вариациями. Воспоминания и размышления, М., 1969.

ВАЛЬТЭР (Walther) Іаганес (20.7.1860—4.5.1937), нямецкі геолаг, географ і палеантолаг. Праф. Іенскага ун-та (з 1890), праф. ун-та і дырэктар Мінералагічнага ін-та ў Галле (з 1906). Вывучаў сучасныя і выкапнёвыя пустыні Афрыкі, Паўн. Амерыкі, Закаспія і інш., працэсы дэнудацыі ў іх. Працаваў у галінах палеакліматалогіі, фіз. геаграфіі і глебазнаўства. Даследаваў праблему ўзнікнення і развіцця латэрытаў. Вывучаў марскую флору і фаўну, умовы асадканамнажэння на дне мораў. Яго працы па біялогіі мора стварылі аснову для палеаакіяналогіі. Вызначыў залежнасць паслядоўнасці напластавання асадкавых горных парод ад паступовага перасоўвання фацый, якое адбываецца са зменай літалагічнага саставу парод (закон Вальтэра — Галоўкінскага). Ганаровы член АН СССР (1930).

Літ.: Высоцкий В. П. Иоганнес Вальтер и его роль в развитии геологии, М., 1965.

ВАЛЬТЭР СКОТ, англійскі пісьменнік. Гл. *Скот* Вальтэр.

ВАЛЬФКОВІЧ Сямён Ісакавіч [н. 11(23).10. 1896, г. Ананьеў Херсонскай губ.], савецкі хімік і тэхнолаг. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1939). Асн. працы ў галіне хіміі і тэхналогіі фосфару, фосфарнай к-ты і яе соляў, а таксама азотных, калійных і фторыстых злучэнняў (перапрацоўка айчыннай сыравіны і тэхналогія атрымання канцэнтраваных і комплексных угнаенняў і кармавых сродкаў для жывёлагадоўлі). З 1937 чл. прэзідыума, з 1963 прэзідэнт Усесаюзнага хім. т-ва імя Мендзялеева. Даярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі, залатым медалём імя Мендзялеева.



Літ.: Семен Исаакович Вольфкович, 2 изд., М., 1966 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР).

ВАЛЬФРАМ (Wolframium), W, хімічны элемент VI групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 74, ат. м. 183,85. Прыродны В. складаецца з 5 ізатопаў з масавымі лікамі 180, 182—184 і 186. Вядомы штучныя радыеактыўныя ізатопы.

Адкрыты В. у 1781 швед. хімікам К. В. Шэеле. У зямной кары знаходзіцца $1 \cdot 10^{-4}$% па масе, трапляецца ў выглядзе мінералаў. В.— светла-шэры метал, шчыльн. 19 300 *кг/м*³, *t* пл. 3380 °С (самы тугаплаўкі з усіх элементаў, акрамя вугляроду), *t* кіп. 5900 °С. Хімічна вельмі ўстойлівы. Праяўляе валентнасці ад II да VI, больш характэрныя і ўстойлівыя злучэнні з валентнасцю VI. Узаемадзейнічае толькі пры нагрэванні з кіслародам, галагенамі (акрамя фтору), азотам, вугляродам. З фторам рэагуе пры звычайных т-рах, з вадародам не ўзаемадзейнічае нават пры вельмі высокіх. Пры звычайных т-рах кіслоты (акрамя сумесі азотнай і плавіковай) і шчолачы (пры адсутнасці кіслароду) на В. не дзейнічаюць. Найбольш важныя злучэнні: трохвокіс WO_3, вальфрамавая к-та H_2WO_4 і яе солі. Здабываюць В. з *вальфрамавых рудаў*. З яго вырабляюць ніці напальвання электралямпаў, кантакты электраапаратуры, катоды генератарных лямпаў, газаразрадных і рэнтгенаўскіх трубак і інш. Гл. таксама *Вальфрамавыя сплавы*.

Літ.: Основы металлургии, т. 4 — Редкие металлы, М., 1967.

В. В. Хадыка. Мінск.

ВАЛЬФРАМАВЫЯ РУДЫ, мінер. агрэгаты з эканамічна выгаднай для здабычы колькасцю вальфраму. Гал. рудаўтваральныя мінералы *вальфраміт* $(Mn, Fe)WO_4$ (да 76,5% WO_3) і шэеліт $CaWO_4$ (да 80,6% WO_3). У рудах карэнных радовішчаў 0,06—0,3% (часам да 2%) WO_3, у россыпях 0,015—0,03%. У плаўку ідзе ўзбагачаны да 60% WO_3 канцэнтрат (гл. *Абагачэнне карысных выкапняў*). В. р. часта змяшчаюць у прамысл. колькасцях малібдэн, волава, вісмут і інш. кашт. кампаненты. Радовішчы В. р. звязаны з інтрузіямі пародаў гранітнага саставу, трапляюцца ў пегматытавых і кварцавых жылах, *грэйзенах*, а таксама ў *скарнах* на кантактах гранітаў з вапнякамі, акрамя таго ў россыпях. Радо-

вішчы ў СССР, Кітаі, ЗША, Балівіі, Бразіліі, Аргенціне, Канадзе, Партугаліі, Бірме, Тайландзе і інш.

Літ.: Бы б о ч к и н А. М. Месторождения вольфрама и закономерности их размещения, М., 1965.

М. В. Вераценнікаў. Мінск.

ВАЛЬФРАМАВЫЯ СПЛАВЫ, легіраваныя вальфрамам металы. На аснове жалеза атрымліваюць: феравальфрам (55—80% W), які ідзе на легіраванне вальфрамавых сталяў пры іх выплаўцы; інструментальную легіраваную сталь (9—18% W); гарачастойкія і гарачатрывалыя сталі (2,5—14% W); канструкцыйную сталь, легіраваную (1—2% W).

У авіябудаванні, ядзернай і касм. тэхніцы выкарыстоўваюцца сплавы вальфраму з тугаплаўкімі і рэдкімі металамі. Вальфрамарэніевыя сплавы, у якіх 10—26% рэнію (Re), ідуць на выраб дэталяў лятальных апаратаў, ліставога металу (пластычны да т-ры —160 °С), тэрмапараў (устойлівыя да 2760 °С; імі вымяраюць т-ру цеплавыдзяляльных элементаў атамнага рэактара). Вальфраматанталавыя сплавы (75—90% Ta) адносяцца да *гарачатрывалых і гарачаўстойлівых матэрыялаў*. Вальфрамамедныя сплавы (10—40% Cu) ужываюцца для паяння металу са шклом. Сплаў вальфраму з 15—50% малібдэну мае лепшыя тэхнал. ўласцівасці, чым чысты вальфрам. Карбід вальфраму ідзе на выраб *цвёрдых сплаваў* для рэальнага інструменту. З дысіліцыду вальфраму і малібдэну робяць тэрмапары, якія могуць працаваць у акісляльнай атмасферы пры т-ры да 1700 °С.

Літ.: Строев А. С., Овсепян Е. С. и Захарова Г. В. Тугоплавкие металлы: молибден, вольфрам, ниобий и тантал, М., 1960; Савицкий Е. М. и Бурханов Г. С. Металловедение тугоплавких металлов и сплавов, М., 1967.

У. Р. Хабасевіч. Мінск.

ВАЛЬФРАМІТ, мінерал (Fe, Mn)WO_4, ізаморфная сумесь ферберыту $FeWO_4$ і гюбнерыту $MnWO_4$. Крышталі тоўстатаблітчастыя, радзей прызматычныя і тычкаватыя манакліннай сістэмы, са штрыхоўкай на гранях. Колер ад бурага да чорнага, бляск металічны. Цв. 4—5,5; шчыльн. 6700—7500 *кг/м*³. Трапляецца ў кварцавых і пегматытавых жылах, у *грэйзенах, скарнах, россыпях* у асацыяцыі з мускавітам, тапазам, флюарытам, берылам, вісмуцінам, малібдэнам і інш. Галоўная вальфрамавая руда.

Літ.: Барабанов В. Ф. Минералогия вольфрамитовых месторождений Восточного Забайкалья, [т. 1], Л., 1961.


ВАЛЬФСОН Сямён Якаўлевіч [27.5(8.6).1894, г. Бабруйск — 1941], беларускі савецкі філосаф. Акад. АН БССР (1928), праф. БДУ (1921). Скончыў юрыд. ф-т Кіеўскага ун-та (1919). З 1931 дырэктар Ін-та філасофіі і права АН БССР, сакратар аддз. грамадскіх навук АН БССР. Чл. ЦВК БССР (1929—38). Вёў навук. работу па гісторыі філасофіі, праблемах сям'і і шлюбу, навукі і культуры. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.



Тв.: Плеханов, Мн., 1924; Диалектический материализм, 6 изд., ч. 1—3, Мн., 1926; Интеллигенция как социально-экономическая категория, Л., 1926; Социология брака и семьи, Мн., 1928; Сучасная рэлігійнасць, Мн., 1930; Аб ленінскім этапе вялікічага атэізму, Мн., 1932; (разам з І. Ільюшыным) Аб пралетарскім інтэрнацыяналізме, Мн., 1935; Суч праць расавых тэорый, Мн., 1935; Семья и брак в могиле, Мн., 1940.

ВАЛЬЦОЎКА, 1) спосаб гарачай апрацоўкі металаў ціскам у вярчальных штампах. Ужываецца для штампоўкі паковак простай формы (ключы, свердзелы, звенні ланцуга).

Робіцца на коваўчых вальцах, асн. частка якіх — валкі з замацаванымі сектарнымі штампамі (гл. рыс.). Бываюць аднаклецевыя (адна пара валкоў) і шматклецевыя. Нагрэтую загатоўку падаюць у коваўчыя вальцы ў момант, калі разыходзяцца штампы. Пры вярчэнні штампы захопліваюць загатоўку, абціскаюць яе і выдаюць гатовую прадукцыю. На Мінскім трактарным з-дзе вальцоўкай атрымліваюць пакоўкі размеркавальных валоў, шатуноў і інш.



Коваўчыя вальцы.

2) Спосаб трывалага злучэння трубы ў адтуліне метал. сценкі раскаткаю; інструмент для раскаткі канцоў трубаў пры вальцовачным злучэнні. 3) Стварэнне на плоскіх або пустацелых загатоўках рэльефу (кантаў, рубаў); робіцца на вальцмашынах. 4) Згінанне метал. лістоў на трох- або чатырохвалковых машынах-вальцах. 5) Раздрабленне ці размол камякоў і вярністых матэрыялаў на вальцавых драбілках з гладкімі або рыфлёнымі валкамі. 6) Перапрацоўка гліны ў керамічнай вытворчасці. Гліна зацягваецца валкамі, праціскаецца праз адтуліны на іх паверхні і скочваецца палосамі ў бункер. Вальцы выпускае магілёўскі з-д «Строммашына».

ВАЛЭПКАВІЧЫ, вёска ў Сольскім с/с Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба народаў». За 30 *км* на ПнЗ ад Смаргоні, 256 *км* ад Гродна, 11 *км* ад чыг. ст. Солы. 273 ж., 86 двароў (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ВАЛЮМІНА ЛЕГУМ (лац. Volumina legum), збор законаў, сеймавых пастаноў, прывілеяў і інш. актаў, якія дзейнічалі на тэр. Польшчы, Беларусі, Літвы і правабярэжнай Украіны да 1793—95. Упершыню 8 тамоў В. л. выдадзены ў Варшаве ў 1732—82. У іх сабраны акты з 1347 да 1780.

І. П. *Агрызка* перавыдаў гэтыя 8 тамоў у 1859—60 у Пецярбурзе. У 1889 выйшаў 9-ы т. (акты 1782—92) і ў 1952 — 10-ы т. (акты з 1793). В. л.— неафіцыйнае выданне і не з'яўляецца поўным зборам законаў. Разам з актамі, узятымі з арыгінальных крыніц, у гэтым зборніку трапляюцца і акты, узятыя з прац асобных аўтараў. Многа дакументаў не ўвайшло ў В. л.

Для вывучэння гісторыі Беларусі значную каштоўнасць маюць акты В. л., якія адносяцца да дзейнасці органаў дзярж. кіравання і ўлады, адлюстроўваюць класавую барацьбу і сацыяльна-эканам. адносіны.

Публ.: Volumina legum, t. 1—8, Petersburg, 1859—60, t. 9, Kraków, 1889, t. 10, Poznań, 1952.

І. А. Юхо. Мінск.

ВАЛЮНТАРЫЗМ (ад лац. voluntas воля), ідэалістычная плынь у філасофіі і псіхалогіі, якая аб'яўляе волю вышэйшым, творчым

прынцыпам быцця, першаасновай усяго існага, проціпастаўляе валявы пачатак аб'ектыўным законам прыроды і грамадства. В. абсалютызуе псіхічнае жыццё чалавека, адмаўляе прычынную сувязь з'яў і магчымасць навук. пазнання рэчаіснасці. Несумяшчальны з навукова-матэрыялісг. светапоглядам, варожы прынцыпам сацыяліст. дэмакратыі.

Як філас. кірунак В. узнік у 19 ст. Найб. вядомыя прадстаўнікі — А. *Шапенгаўэр*, Ф. *Ніцшэ*, Э. Гартман. Шапенгаўэр сцвярджаў, што ў аснове ўсіх з'яў ляжыць нічым не абумоўленая «сусветная воля». Ніцшэ надаў В. агрэс. характар, абвясціў рухальнай сілай гісторыі «волю да ўлады» і «культ сілы». Гэтыя погляды Шапенгаўэра і Ніцшэ з'явіліся адной з гал. ідэйных крыніц фашызму. Валюнтарыстамі былі народнікі, эсэры, анархісты, якія адмаўлялі аб'ектыўныя гістар. заканамернасці і прызнавалі дзеянне толькі асобных індывідаў, тэрор і сілу. У канцы 19 — пач. 20 ст. В. пранік у псіхалогію (В. Вунт, Г. Мюнстэрберг). Тут ён выяўляўся ў прызнанні прымату волі ў дачыненні да астатніх псіхічных функцый. В.— адна з рысаў сучаснай бурж. філасофіі (гл. *Прагматызм, Экзістэнцыялізм*). Тэрмін В. ужываецца таксама для характарыстыкі сацыяльна-паліт. дзейнасці асоб, якія не лічацца з аб'ектыўнымі законамі гістар. працэсу (гл. *Суб'ектывізм*).

Літ.: Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў?, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); Я г о ж. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, раздз. 3, § 6 (Полн. собр. соч., т. 18, гл. 3, § 6).

Э. В. Клёсава. Мінск.

ВАЛЮТА (італьян. valuta, ад лац. valeo каштую), 1) грашовая адзінка, якая ляжыць у аснове грашовай сістэмы (напр., рубель у СССР, долар у ЗША). 2) Тып грашовай сістэмы (залатая, сярэбраная, папяровая і інш. В.). 3) Грашовыя знакі замежных дзяржаў, а таксама крэдытныя і плацежныя дакументы (вэксалі, чэкі), якімі карыстаюцца ў міжнар. разліках. Сучаснаму капіталізму характэрны няўстойлівыя, падаючыя В. (гл. *Інфляцыя*). Капіталіст. краіны штучна падтрымліваюць намінальную залатую вартасць сваіх В. Напр. у ЗША, дзе ўзровень цэн на тавары павышаўся паводле афіц. звестак павысіўся ў параўнанні з даваенным часам больш чым у 2,5 раза, захоўваецца залатая вартасць долара, вызначаная ў 1934.

В. капіталіст. краін падзяляецца на абарачальную (канверсаваную), часткова абарачальную і неабарачальную. У краінах, дзе няма валютных абмежаванняў, В. абменьваецца на любую іншаземную (амер. долар, швейц. франк), яна абарачальная. Да часткова абарачальнай адносіцца В. большасці еўрап. краін (Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, ФРГ, Фінляндыі і г. д.), у якіх В. абарачальная толькі ў межах валютнай зоны (напр., *стэрлінгавая зона* — англ. фунт і г. д.) ці ў пэўных валютных аперацыях (напр., выдача В. турыстам). Неабарачальнай з'яўляецца В. краін, якія поўнасцю захоўваюць валютныя абмежаванні ва ўсіх валютных аперацыях.

Устойлівасць В. сацыяліст. краін забяспечваецца не толькі наяўным залатым запасам, але перш-наперш масай тавараў, якія паступаюць у абарачэнне па ўстойлівых планавых цэнах. Спрыяе гэтаму бяскрызіснае развіццё нар. гасп., планаванне грашовага абарачэння і тавараабароту, валютная манаполія і г. д. У сувязі з далейшым абмяцненнем В. капіталіст. краін і ростам пакупной здольнасці сав. рубля з 1.1.1961 залатая вартасць рубля павялічылася з 0,222168 *г* да 0,987412 *г* чыстага золата. Адпаведна павышаны і курс рубля ў адносінах да замежнай В.

Літ.: Валютные отношения во внешней торговле СССР, М., 1968; Стадниченко А. И. Валютные потрясения на Западе, М., 1968; Валютный справочник, М., 1967; Валюты стран мира. Справочник, М., 1970.

ВАЛЮТА (у архітэктуры), дэкаратыўныя і арнаментальныя дэталі ў выглядзе завіткоў.

ВАЛЮТНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА, рэгулюе парадак разлікаў СССР з іншаземнымі дзяржавамі, правілы пераводаў, перасылкі, вывазу і ўвозу каштоўных металаў і *валюты*, вызначае курс савецкага рубля ў адносінах да грашовых адзінак зарубежных краін.

Паводле Канстытуцыі СССР В. з. належыць да кампетэнцыі вышэйшых органаў дзярж. улады і вышэйшых органаў дзярж. кіравання Саюза ССР. Ад імя Сав. дзяржавы В. з. могуць ажыццяўляць *Дзяржбанк СССР* і Знешгандальбанк СССР. Накіравана на ўмацаванне грашовай і валютнай сістэмы СССР, на рост і ўмацаванне эканам. і фін. магутнасці нашай краіны, на павышэнне плацежаздольнасці сав. грошай, на стабільнасць іх міжнар. значэння і ролі ў знешнегандлёвых адносінах. Кантроль і рэгуляванне аперацый па выкананні В. з. ажыццяўляе Мін-ва фінансаў СССР. Асновы савецкага В. з. вызначаны дэкрэтамі СНК РСФСР ад 6.10.1921 і 4.4.1922. Дзейнічаюць нарматыўныя акты пра В. з.: пастанова ЦВК і СНК СССР ад 7.1.1937 «Пра здзелкі з валютнымі каштоўнасцямі і пра плацяжы ў іншаземнай валюце»; пастанова Савета Міністраў СССР ад 25.10.1948 «Пра парадак вывазу, ўвозу, пераводу і перасылкі за рубеж і з-за рубяжа валюты і валютных каштоўнасцей» з пазнейшымі зменамі і дадаткамі; пастанова Савета Міністраў СССР «Пра павышэнне з 1.1.1961 года залатога вместу і курсу рубля ў адносінах да замежных валют»; Статут Дзяржбанка СССР; Статут Знешгандальбанка СССР; Таможны кодэкс СССР і інш. За парушэнне В. з. наступае адказнасць, якая прадугледжана крымін. і таможным кодэксамі.

Літ.: Валютные отношения во внешней торговле СССР. Правовые вопросы, М., 1968.

С. Р. Віхараў. Мінск.

ВАЛЮТНАЯ МАНАПОЛІЯ, выключнае права сацыяліст. дзяржавы рабіць аперацыі з валютнымі каштоўнасцямі (наяўная замежная валюта і выражаныя ў ёй плацежныя дакументы, каштоўныя паперы). Непарыўна звязана з манаполіяй знешняга гандлю і з'яўляецца сродкам яго ажыццяўлення. У СССР фактычна існуе з крас. 1918 пасля нацыяналізацыі знешняга гандлю. Заканадаўча ўведзена ў кастр. 1921. Забяспечвае планамернасць у міжнар. валютных, крэдытных і разліковых адносінах, спрыяе развіццю прадукцыйных сіл шляхам планавай канцэнтрацыі і выкарыстання валютных каштоўнасцей, умацоўвае грашовую сістэму і засцерагае яе ад валютнай спекуляцыі і ўздзеяння стыхіі капіталіст. грашовага рынку. З утварэннем сусв. сістэмы сацыялізма В. м. спрыяе таксама ўзгадненню валютных адносін паміж сацыяліст. краінамі.

Сваімі мэтамі, сацыяльна-эканам. зместам і выпікамі В. м. істотна адрозніваецца ад валютных абмежаванняў, якія ажыццяўляюцца ў капіталіст. краінах шляхам забароны свабоднай куплі і продажу замежнай валюты, уводу абавязковага яе абмену на нац. валюту. Такія абмежаванні робяцца, каб ураўнаважыць плацежныя балансы, падтрымаць курсы сваіх валют і канцэнтрацыю валютных рэсурсаў у руках дзяржавы для інтарэсаў манаполій. Яны звязаны з пасіўнасцю плацежных балансаў, з вычэрпваннем залатых і валютных рэзерваў. Ускладняюць знешні гандаль і

ўзмацняюць валютную вайну паміж капіталіст. дзяржавамі.

Літ.: Гл. пры арт. *Валюта. Л. А. Рубанаў.* Мінск.

ВАЛЮТНАЯ ПАЛІТЫКА, мерапрыемствы, якія ажыццяўляюцца дзярж. і цэнтр. банкамі для рэгулявання валютных адносін. Абумоўлена сацыяльна-эканам. ладам дзяржавы, становішчам яе *грашовага абарачэння* і *знешнім гандлем.*

У капіталіст. краінах рэгуляванне *валютнага курсу* ажыццяўляецца праз дысконтную палітыку (павышаючы працэнтныя стаўкі за крэдыт, банкі прыцягваюць капітал з інш. краін і т. ч. павышаюць валютны курс краіны) і праз дэвізную палітыку (купля і продаж замежнай валюты). Ва ўмовах агульнага крызісу капіталізму дэвізная палітыка набывае формы непасрэднага ўмяшання дзяржавы ў аперацыі з іншаземнай валютай: валютнай інтэрвенцыі (распродаж валюты сваёй ці іншаземнай дзяржавы), валютнага дэмпінгу (продаж па зніжанай цане тавараў з краін, дзе валюта абясцэнена) і г. д. Бурж. эканамісты перабольшваюць значэнне В. п., лічаць, што капіталіст. дзяржава здольна вызначаць пакупную сілу грошай, рух таварных цэн і эканам. кан'юнктуру цалкам, і нават бачаць у В. п. адзін з сродкаў «бяскрызіснага» развіцця капіталізму. У сапраўднасці В. п. мае абмежаваны ўплыў на валютна-эканам. становішча краіны, не можа папярэдзіць валютнага крызісу. В. п. краін, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, садзейнічае росту іх знешняга гандлю, паляпшэнню плацежнага і гандл. балансу. Для В. п. гэтых краін характэрна шырокае ўжыванне валютных абмежаванняў: забарона продажу валюты на адкрытым рынку, абмежаванне ці поўная забарона пераводаў валюты за мяжу, аблажэнне пераводных аперацый падаткам, абавязковая для ўсіх грамадзян здача казначэйству замежнай валюты, абмен яе на нац. валюту. Такія абмежаванні даюць магчымасць папоўніць запасы замежнай валюты, абмежаваць дзейнасць замежных кампаній, умацаваць пазіцыі дзяржавы ў разліках з інш. краінамі.

В. п. сацыяліст. краін заснавана на дзярж. *валютнай манаполіі* і мае на мэце планамерную арганізацыю міжнар. разлікаў, умацаванне сацыяліст. валют, павышэнне валютнага курсу, абарону незалежнасці сацыяліст. эканомікі, дапамогу краінам, якія сталі на шлях самастойнага развіцця.

Літ.: Гл. пры арт. *Валюта.*

ВАЛЮТНЫ КУРС, цана грашовай адзінкі, якая выражаецца ў грашовых адзінках інш. краін (на жн. 1970 В. к. англ. ф. ст.— 2,1498 руб.; франц. фр.— 0,1631 руб.). Капіталіст. краінам характэрна няўстойлівасць В. к., яго адхіленне ад *валютнага парытэту.* В. к. сацыяліст. краін не залежыць ад стыхіі сусв. капіталіст. рынку, яго ўстойлівасць забяспечваецца планавай сацыяліст. гаспадаркай.

ВАЛЮТНЫ ПАРЫТЭТ, суадносіны паміж валютамі розных краін на аснове іх залатой вартасці, зафіксаванай паводле закону краіны ці ў *Міжнародным валютным фондзе.* Напр., В. п. долара ЗША да сав. рубля — 90 кап. за 1 дол.: рубель змяшчае 0,987412 *г*, а долар — 0,888671 *г* чыстага золата.

ВАЛЮШНЯ (валюш, сукнавальня), майстэрня для вырабу сукна, лямцу, валёнак і інш. У мінулым на Беларусі В. звычайна існавалі пры млынах.

ВАЛЯР'ЯН, маун (Valeriana), род шматгадовых травяністых раслін сям. валяр'янавых. Выш. 5—200 *см.* Лісце цэласнае або няпарнаперыстае. Кветкі дробныя, духмяныя, ружаватыя, радзей белыя, сабраныя ў шчыткападобныя або мяцёлчатыя суквецці. Вядома больш за 200 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Амерыцы. У СССР 30 відаў, на Беларусі 1 — В. лекавы (V. officinalis, нар. назвы: аўрыян, дуброўка, капроўнік лесавы, грудоўка). Расце на вільготных лугах, у хмызняках, лясах, на балотах. Культывуецца як лекавая расліна. У карэнішчах і каранях



ёсць эфірны алей, валяр'янавая і інш. арган. кіслоты, алкалоіды, барнеол, дубільныя рэчывы, цукар. Прэпараты В. (настоі, мікстуры) ужываюцца ў медыцыне.

Літ.: Ворошилов В. Н. Лекарственная валериана, М.— Л., 1959.

ВАЛЯЎКІ, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 28 *км* на У ад Дуброўна, 120 *км* ад Віцебска, 9 *км* ад чыг. ст. Краснае. 172 ж., двароў 48 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі загубілі 29 жыхароў вёскі.

ВАМПІР, міфічны вобраз у фальклоры еўрапейскіх народаў — мярцвяк, які пібыта выходзіць з магілы, каб смактаць кроў жывых людзей. У некат. вераваннях вобраз В. зліўся з *вайкалакам.*

ВАМПІРЫ (Vampyrus), род лятучых мышэй сям. лістаносаў (Phyllostomidae). Пашыраны ў Цэнтр. і Паўд. Амерыцы. Самы буйны прадстаўнік — вялікі В. (V. spectrum). Даўж. 16 *см*, размах крылаў 70 *см.* Поўсць мяккая, на спіне каштанава-бурая, на брушку жоўтакарычневая. Назва яго не адпавядае характару жыўлення: В. корміцца насякомымі і пладамі. Сапраўдныя крывасмокі — лятучыя мышы родаў Desmodes і Diphylla сям. Desmodontidae. Жывяцца крывёю птушак і млекакормячых жывёл. Нападаюць на чалавека. Маюць вельмі вузкія стрававод і страўнік. Вострымі зубамі яны пракусваюць скуру і злізваюць кроў з раны. У сліне іх ёсць анестэзійнае і антыкаагуляцыйнае рэчывы, таму раны ад укусаў не баляць і кроў не згусае. Адна асобіна за год выпівае да 7 *л* крыві. Пераносчыкі ўзбуджальнікаў шаленства.

Літ.: Кузякин А. П. Летучие мыши, М., 1950; Курсков А. Н. Живые радары, Мн., 1966. *А. М. Курскоў.* Мінск.

ВАН, старажытны горад Закаўказзя на паўд.-ўсх. беразе воз. Ван. З 9—8 ст. да н. э. сталіца дзяржавы *Урарту* пад назвай Тушпа (назва Ван адносіцца да 4 ст. да н. э.). Пазней значны гандлёва-рамесніцкі цэнтр Ст. Арменіі. В. захоплівалі і разбуралі іншаземныя заваёўнікі (арабы, візантыйцы, туркі і інш.). У В. абярэгліся рэшткі стараж. крапасных забудоў, помнікі мастацтва, клінапісныя надпісы. З 17 ст. пад уладай Турцыі. У

1-ю сусв. вайну арм. насельніцтва В. выселена і знішчана младатуркамі.

Літ.: Гл. пры арт. *Урарту.*

ВАНАГ (Vanags) Юлій Пятровіч (н. 8.7.1903, хутар Ірбесала вол. Медню), латышскі савецкі пісьменнік. Засл. дз. культ. Латв. ССР (1953). Сын рамесніка. Быў чыгуначнікам, лесарубам, бібліятэкарам, меў сувязь з нелегальным рэвалюц. рухам. Друкуецца з 1927. Удзельнік Айч. вайны. Выдаў зб. «У варотах сонца» (1946), «Глыбокае ворыва» (1950), «Горкія кветкі» (1960), «Зямля» (1963), «З чашы ўспамінаў» (1965) і інш. Аўтар апавяданняў для дзяцей і юнацтва, п'ес «Сустрэча на беразе» (1947), «Карабель выходзіць у мора» (1955), «Балада пра невядомага салдата» (1967), сааўтар кінасцэнарыяў («Аповесць пра латышскага стралка» і інш.), тэксту гімна Латв. ССР (1944). Пераклаў на латышскую мову «Беларускія народныя казкі», «Дрыгву» Я. Коласа, «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» І. Мележа, «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля і інш. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Бел. пер.— Вялікія справы маленькага Мікіна. [Апавяданні]. Мн., 1957; у кн.: Ветрык, вей! Вершы, Мн., 1959; рус. пер.— Стихи, Рига, 1951; Земля. Баллады, М., 1955; Песня глухаря.— Хромой волк. Повести, Рига, 1966. *А. Я. Вілсан.* Рыга.

ВАНАДАТЫ прыродныя, група мінералаў, солі ванадыевай кіслаты H_3VO_4. У прыродзе каля 50 мінер. відаў і разнавіднасцей. Характэрны злучэнні з свінцом і падвойныя злучэнні свінцу або кальцыю з меддзю, цынкам, магніем.

Найбольш устойлівыя бязводныя В. з вял. катыёнамі (*ванадыніт*, дэклуазіт $Pb(Zn, Cu)[VO_4](OH)$ і інш.) і водныя В. з малымі (гідратаванымі) і вельмі вял. катыёнамі. Сярод апошніх паводле саставу вылучаюцца «уранавыя слюдкі» (падвойныя солі двухвалентных металаў з уранам: тарберніт $Cu[UO_2]_2[PO_4]_2 \cdot 12H_2O$, *карнатыт* і інш.) і складаныя ванадаты.

Трапляюцца ў форме крышталяў, парашкоў, палётаў. Колер пераважна жоўты, зялёны, буравата-чырвоны. Цв. 2—4; шчыльн. 2500—8000 *кг/м*³. Паходжанне выключна экзагеннае (другасныя мінералы ў зоне акіслення рудных радовішчаў, а таксама ў асадкавых горных пародах). Радовішчы ў ЗША, Паўд.-Зах. Афрыцы і інш.

ВАНАДЫЕВЫЯ СПЛАВЫ, легіраваныя *ванадыем* металы.

На аснове жалеза атрымліваюць феравanадый (больш за 35% V), які ідзе на легіраванне ванадыевых сталяў пры іх выплаўцы. У інстр. хуткарэзнай сталі да 5,1% ванадыю, у хромаванадыевай — да 0,3%. У ядзернай і касм. тэхніцы сплаў ванадыю з 10—50% тытану выкарыстоўваецца на лісты, прутки, трубкі. Сплаў ванадыю з 20—60% ніобію і дамешкамі тытану, малібдэну, рутэнію мае найб. трываласць пры т-ры да 1100 °С. Недахоп В. с.— малая ўстойлівасць у акісляльных асяроддзях, таму вырабы з В. с. засцерагаюцца ад карозіі ахоўнымі пакрыццямі.

Літ.: Поляков А. Ю. Основы металлургии ванадия, М., 1959.

ВАНАДЫЙ (Vanadium), V, хімічны элемент V групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 23, ат. м. 50,942. Прыродны В. складаецца з двух ізатопаў: ^{51}V (99,75%) і слаба радыеактыўнага ^{50}V (0,25%). Вядомы штучныя радыеактыўныя ізатопы.

В. адкрыты ў злучэннях у 1801 мекс. вучоным А. М. дэль Рыо. У зямной кары знаходзіцца 0,015% па масе, трапляецца ў выглядзе мінералаў, належыць да *рассеяных элементаў.* В.— серабрыста-шэры метал, шчыльн. 6110 *кг/м*³, *t* пл. 1900± ±25 °С, *t* кіп. 3400 °С. Мае выключную цвёрдасць і вял. трываласць пры расцяжэнні. Растварaецца ў плавіковай і моцных азотнай і сернай к-тах. Вада, растворы к-т і шчолачаў на В. не дзейнічаюць. Пры награванні ўзаемадзейнічае з кіслародам, фторам, азотам, вуглародам. Пагляднае вадарод. Утварае злучэнні з валентнасцямі ад II да V. Найбольш устойлівыя і маюць практычнае значэнне злучэнні з вышэйшымі валентнасцямі (V_2O_5). Здольны ўтвараць комплексныя злучэнні. Крыніца здабычы В.— жалезныя і поліметалічныя руды. Асн. галіна ўжывання (да 95%) — чорная металургія (гл. *Ванадыевыя сплавы*). Злучэнні В. выкарыстоўваюцца ў хім. прамысл. (як каталізатары), с. гасп., медыцыне, гумавай, шкляной вытворчасці і інш. Злучэнні В. ядавітыя.

Літ.: Холодов В. Н. Ванадий, М., 1968.

ВАНАДЫНІТ, мінерал групы *ванадатаў* $Pb_5[VO_4]_3Cl$. Крышталі прызматычныя, востранірамідальныя, ігольчастыя гексаганальнай сістэмы. Трапляецца ў зямлістых і валакністых масах. Колер ад жоўтага да бурага. Цв. 2,5—3; шчыльн. 6660—7100 *кг/м*³. Рэдкі мінерал экзагеннага паходжання ў зоне акіслення свінцова-цынкавых радовішчаў. Каштоўная ванадыевая руда. Радовішчы ў СССР, ЗША, Іспаніі.

ВАН ВЭЙ (другое імя Мо Цзе; 701, г. Таюань — 761), кітайскі паэт і мастак. Адзін з выдатных майстроў пейзажу ў кіт. паэзіі і жывапісе. У вершах славіў прыроду і чалавека, яго духоўную сілу, марыў пра ідэальную дзяржаву без нястачы і падаткаў. Пісаў пра падзеі даўніны. Лірыка В. В. прасякнута настроямі прасветленасці і спакою. Лічыцца стваральнікам пейзажнага жывапісу тушшу і аўтарам трактата «Таямніцы жывапісу».

Тв.: Рус. пер.— Стихотворения, М.—Л., 1959; у кн.: Три танских поэта, М., 1960.

ВАН ВЭЙК (van Wyk) Нікалас (17.10.1880— 7.4.1941), галандскі мовазнавец-славіст. Праф. Лейдэнскага ун-та (1923). Даследчык галандскай, балтыйскіх і стараславянскай моў, слав. акцэнталогіі. Аналізуючы ўсх.-слав. мовы, немалое месца адводзіў вывучэнню развіцця і асаблівасцей бел. мовы. Аўтар прац: «Балтыйскія і славянскія сістэмы націску і інтанацыі» (1923), «Гісторыя стараславянскай мовы» (1931) і інш.

Тв.: Les langues slaves. De l'unité à la pluralité, 2 éd., Mouton — s-Gravenhage, 1956; К истории фонологической системы в общеславянском языке позднего периода, «Slavia», Praha, 1950, r. 19, seš. 3—4.

ВАНГІ, вёска ў Пескаўскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Свір-танне». За 52 *км* на ПдЗ ад Ліды, 124 *км* ад Гродна, 29 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 261 ж., дваroў 81 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ВАН ГОГ (van Gogh) Вінсент (30.3.1853, Грот-Зюндэрт, Паўн. Брабант — 29.7.1890), галандскі жывапісец. Адзін з пачынальнікаў постімпрэсіянізму. Раннія творы, прасякнутыя спагадай да цяжкага жыцця простых людзей Галандыі, напісаны ў змрочнай, стрыманай гаме («Едакі бульбы», 1885). З 1886 жыў у Францыі, дзе пісаў пейзажы («Рыбацкія лодкі ў Сент-Мары», 1888; «Вароны над



пшанічным полем», 1890), партрэты («Аўтапартрэт», «Дзядзька Танґі», абодва 1887), нацюрморты («Слапечнікі», 1888), інтэр'еры («Спальня мастака ў Арлі», 1888). Гэтым творам уласціва дынамічная манера пісьма пастознымі авілістымі мазкамі, светлая, інтэнсіўная колеравая гама, пабудаваная на вострых кантрастах. Пазней у творчасці В. Г. страсная эмацыянальнасць, драм. ўспрыманне жыцця, рысы сац. пратэсту і пакутлівыя пошукі духоўных каштоўнасцей спалучаюцца з напружанай суб'ектыўнай экспрэсіяй («Чырвоныя вінаграднікі ў Арлі», 1888; «Прагулка зняволеных», 1890). Скончыў жыццё самагубствам.

Літ.: Ван-Гог. [Альбом], пер. с чеш., Прага, 1963.

ВАНДАЛЫ (лац. Vandali), група старажытнагерманскіх плямёнаў. Спачатку жылі на Скандынаўскім п-ве, у 1—3 ст. займалі раён сярэдняга і верхняга Одэра. У пач. 5 ст. пад націскам *вестготаў* перасяліліся ў Іспанію. У 429—439 адвалявалі ў Рым. імперыі значную частку Паўн. Афрыкі, заснавалі тут каралеўства — адну з самых моцных дзяржаў Міжземнамор'я. У 455 захапілі і разрабавалі Рым (адсюль вандалізм — масавае знішчэнне помнікаў культуры). У 534 дзяржава В. зававявана *Візантыяй*. Вандальскія заваёвы спрыялі развіццю феад. адносін.

Літ.: Диллигенский Г. Г. Северная Африка в IV—V веках. М., 1961.

ВАНДРОЎНЫ ГОЛУБ (Ectopistes migratorius), вымерлая птушка атр. голубоў. Даўж. калля 40 *см*, размах крылаў 65 *см*. Апярэнне шэрае, на брушку з белым. Быў пашыраны ў Паўн. Амерыцы (на Пд ад Гудзонава заліва). Вынішчаны чалавекам у 90-я г. 19 ст., бо шкодзіў с.-г. культурам і лесу. Апошні загінуў у 1914 у заалаг. садзе Цынцынаты (ЗША).

ВАНДРОЎНЫЯ ТЭАТРЫ (вандроўныя трупы), тэатральныя калектывы, створаныя для паказу спектакляў у розных нас. пунктах, пераважна там, дзе няма стацыянарных т-раў. Як асобная форма прафесійных відовішчаў узніклі ў 19 ст. (вядомы Вандроўны т-р Гайдабурава ў Расіі). У Сав. Саюзе абслугоўваюць насельніцтва гарадоў, рабочых пасёлкаў, калгасаў і саўгасаў (гл. *Калгасна-саўгасныя тэатры*). У Айч. вайну абслугоўвалі часці Сав. Арміі (гл. *Франтавыя тэатры*). На Беларусі да пач. 20 ст. вандроўнымі былі розныя віды нар. т-раў — скамарохаў, батлейка, нар. драма. Вандроўнай па характары дзейнасці была *Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага*. У сав. перыяд сярод В. т.: Першы, Другі і Трэці паказальныя т-ры; т-р пад кіраўніцтвам У. Галубка (гл. *Беларускі трэці дзяржаўны драматычны тэатр*); шматлікія калг.-саўг. т-ры; франтавыя брыгады т-раў імя Я. Купалы і Я. Коласа, оперы і балета, Гомельскага т-ра; *Бабруйскі вандроўны беларускі драматычны тэатр*.

ВАН ДЭЙК (van Dyck) Антоніс (22.3.1599, Антверпен — 9.12.1641), фламандскі жывапісец. Вучыўся ў Х. ван Балена. Каля 1618—20 памочнік у П. П. Рубенса, творча сфарміраваўся пад яго ўплывам. Ужо раннія творы мастака сталі шэдэўрамі рэаліст. флам. жывапісу («Апостал Пётр», калля 1615—17, і інш.). З асаблівым поспехам пісаў партрэты, поўныя хараства і высакароднай адухоўленасці. У 1621—27 жыў у Італіі, выпрацаваў тып урачыстага параднага партрэта барока, якому ўласцівыя велічная элегантнасць вобразаў, багацце цёплай колеравай гамы (партрэт кардынала Г. Бентывольё, каля 1623). Вярнуўшыся ў Антверпен, стварыў побач з рэліг. кампазіцыямі найб. пранікнёныя і глыбокія па характарыстыцы партрэты (Яна ван дэн Ваўэра; серыю «Іканаграфія»). З 1632 працаваў у Лондане як прыдворны мастак Карла I, партрэтыст англ. знаці (партрэты Карла I на паляванні, каля 1635; дзяцей Карла I, 1637; Томаса Чэланера, каля 1632—40). З часам у яго склаўся ўмоўны і безасабовы стандарт арыстакратычнага партрэта.



Літ.: Лисенков Е. Г. Ван-Дейк, Л., 1926; [Смольская Н. Ф.] Антонис ван Дейк, М.—Л., 1963.

ВАНДЭЙСКІЯ ВОЙНЫ, ваенныя дзеянні, якія вялі ўрады Францыі перыяду бурж. рэвалюцыі канца 18 ст. супраць контррэвалюцыйных раялісцкіх мяцяжоў у паўн.-зах. правінцыях Францыі. Назва ад гал. цэнтра контррэвалюцыі — дэпартамента Вандэі.

Арганізатарамі мяцяжоў былі дваранства і духавенства, частка буйной буржуазіі, падтрыманыя Англіяй. Яны ўцягнулі ў контррэвалюц. выступленні частку сялян, асабліва заможныя вярхі. Найб. вядомыя В. в. 1793—95. Значнае па ахопленай тэр. ўзброенае выступленне пачалося 10.3.1793; у ходзе яго вандэйцы захапілі шэраг гарадоў. Пасля ўстанаўлення *якабінскай дыктатуры* палепшылася ваен. кіраўніцтва рэсп. арміі. У чэрв. 1793 вандэйцы былі пераможаны каля г. Нанта. 12—13.12.1793 іх войскі нашчэнт разбіты. На дапамогу мяцежнікам у ліп. 1795 англ. флот высадзіў у Брэтані атрад франц. эмігрантаў, які быў разбіты. Спробы новых мяцяжоў былі ў 1799, 1813, 1815. У ходзе В. в. з абодвух бакоў загінула больш за 600 тыс. чал.

Літ.: Французская буржуазная революция 1789—1794. М.—Л., 1941 (гл. геагр. паказальнік).

ВАН-ДЭР-ВААЛЬСА ЎРАЎНЕННЕ, ураўненне стану рэальных газаў. Выведзена нідэрл. вучоным Я. Д. ван дэр Ваальсам у 1873. Мае выгляд: $\left(p+\frac{a}{V^2}\right)\left(V-b\right)=RT$, дзе V — аб'ём аднаго кіламоля газу пры ціску p і абс. т-ры T, $R=8{,}31\cdot 10^3$ $\frac{дж}{кмоль\cdot град}$ — універсальная газавая пастаянная.

Велічыні a і b пастаянныя, характэрныя кожнаму асобнаму газу: a вызначае велічыню ўнутр. ціску ў газе, абумоўленага сіламі ўзаемнага прыцягнення памiж малекуламі, b у 4 разы большая за ўласны аб'ём усіх малекул у адным кіламолі. У колькасных адносінах В.-д.-В. ў. прыблізнае. Для моцна разрэджанага газу яно пераходзіць ва ўраўненне стану ідэальных газаў $pV=RT$ (гл. *Клапейрона — Мендзялеева ўраўненне*).

В.-д.-В. ў. якасна правільна апісвае паводзіны газаў у вельмі шырокім інтэрвале ціскаў, паказвае на пераход газу ў вадкасць і тлумачыць крытыч. стан. *В. І. Кузьміч.* Мінск.

ВАНЕЕЎ Анатоль Аляксандравіч [1872, Ніжні Ноўгарад — 8(20).9.1899], удзельнік рэвалюц. руху ў Расіі. З сям'і чыноўніка. У 90-я г. вёў падпольную работу ў марксісцкіх гуртках у Ніжнім Ноўгарадзе і Пецярбурзе; у 1893—95 удзельнічаў у стварэнні і дзейнасці *пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа»*. У снеж. 1895 арыштаваны, у 1897 сасланы ва Усх. Сібір на 3 гады, там памёр ад сухотаў. У ссылцы падпісаў складзены У. І. Леніным «Пратэст расійскіх сацыял-дэмакратаў» (1899), накіраваны супраць «эканамістаў».

ВАНЕЕЎ Уладзімір Рыгоравіч [25.7(6.8). 1896, в. Шыпіраўшчына Кацельніцкага пав. Вяцкай губ.— 12.10.1941], парт. і дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1918. З 1915 на Зах. фронце. Удзельнік грамадз. вайны. У 1919—36 на сав. і парт. рабоце. З кастр. 1937 старшыня Мінскага гар. выканкома, са жн. 1938 нарком гандлю БССР, з сак. 1939 нам. Старшыні СНК БССР, з сак. 1941 трэці сакратар ЦК КП(б)Б. На XVII з'ездзе КП(б)Б выбіраўся канд., на XVIII з'ездзе чл. ЦК КП(б)Б, на пленуме 22—24.3.1941 чл. Бюро ЦК КП(б)Б. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. З 23.7.1941 брыгадны камісар, чл. Ваен. савета 19-й арміі Зах. фронту. Загінуў у баі. Узнаг. ордэнам Леніна. Яго імем названа вуліца ў Мінску.



У. Н. Якубоўскі. Мінск.

ВАНЕЛЕВІЧЫ, вёска ў Доктаравіцкім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл., на р. Удова. Цэнтр калгаса «Піянер». За 7 *км* на ПдУ ад Капыля, 127 *км* ад Мінска, 7 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 830 ж., двароў 265 (1970). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле 11 сав. воінаў і партызанаў Вял. Айч. вайны.

ВАНКЕВІЧ Пётр Паўлавіч [н. 6(19).8.1903, в. Баравіно Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. У Чырв. Арміі з 1925. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), абароны Магілёва ў чэрв. 1941. У сак. 1942 арганізаваў партыз. атрад, быў яго камісарам. З ліп. 1943 камісар *партызанскай брыгады 2-й Мінскай*. З чэрв. 1944 на парт. рабоце ў Мінскай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ВАНСОЎСКІ Сяргей Васілевіч [н. 20.8(2.9). 1910, Ташкент], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1969). З 1947 у Ін-це фізікі металаў АН СССР. Асн. працы па вывучэнні маги. і эл. уласцівасцей металаў і паўправаднікоў, па тэорыі ферамагнетыкаў і звышправоднасці металаў. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: (Разам з Я. С. Шурам) Ферромагнетизм, М.—Л., 1948; Современное учение о магнетизме, М., 1953; Природа магнетизма, М., 1964.

ВАНТАВЫЯ КАНСТРУКЦЫІ, гл. *Вісячыя сістэмы*.

ВАНТ ГОФ (van't Hoff) Якаб Гендрык (30.8. 1852, Ротэрдам — 1.3.1911), галандскі хімік, адзін з заснавальнікаў сучаснай фізічнай хіміі і стэрэахіміі. З 1895 замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН. У 1874—75 сфармуляваў тэорыю прасторавага размяшчэння атамаў у малекулах арган. злучэнняў, якая лягла ў аснову сучаснай стэрэахіміі. Навук. працы па хім. кінетыцы, тэрмадынаміцы хім. рэакцый, тэорыі разбаўленых растворaў і па раўнавагах у водна-салявых сістэмах. Нобелеўская прэмія 1901.

Літ.: Памяти Вант-Гоффа, «Успехи химии», 1937, т. 6, в. 1.

ВАНЦЭЦІ Барталамео, гл. ў арт. *Сака — Ванцэці працэс*.

ВАНЦЯН Вачаган Унанавіч [1(14).5.1913, в. Зак Ахалкалацкага пав. Тыфліскай губ.— 1.8.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. Вызначыўся 23.6.1944 пры прарыве абароны праціўніка каля г. п. Шуміліна Віцебскай вобл. Агнём з кулямёта В. знішчыў 3 кулямётныя кропкі і адбіў 2 контратакі ворага. У баі на Нёманскім плацдарме 1.8.1944 паранены, апошняй гранатай падбіў варожы танк і загінуў.

ВАНЧУРА (Vančura) Уладзіслаў (23.6.1891, Гай каля Опавы — 1.6.1942), чэшскі пісьменнік. Камуніст. Нар. мастак Чэхаславакіі (1946, пасмяротна). Урач па адукацыі. Адзін з заснавальнікаў сацыялісг. л-ры ў Чэхаславакіі. З першых твораў (аб. апавяд. «Плынь Амазонкі», 1923; аб. аповесцей «Доўгі, Шырокі і Быстравокі», 1924) выявіліся асаблівасці стылю В.: лаканізм, эмацыянальная насычанасць і метафарычнасць. Раман «Пекар Ян Маргоўл» (1924) пра бесчалавечнасць бурж. ладу. Пратэст супраць імперыялісг. вайны гучыць у рамане «Палі ворыва і вайны» (1925). У рамане «Тры ракі» (1936) паказаў, як пад уплывам Кастр. рэв. просты чэшскі селянін вырас у свядомага рэвалюцыянера. Драма «Возера Укерэве» (1935) заклікала да адзінства народаў перад пагрозай фашызму. У час фаш. акупацыі разам з прагрэс. чэш. гісторыкамі стварaў маст. хроніку «Карціны з гісторыі

чэшскага народа» (т. 1—3, 1939—40), якая абуджала нац. годнасць чэхаў. Расстраляны гітлераўцамі за ўдзел у антыфаш. руху.

Тв.: Spisy, sv. 1—15, Praha, 1951—59; рус. пер.— Пекарь Ян Маргоул, М., 1964; Три реки, М., 1969.

А. В. Мажэйка. Мінск.

ВАНЬКОВІЧ Валенцій Мельхіёравіч (1799, па некат. звестках 14.2.1800, Калюжыца Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 12.5.1842), беларускі і польскі мастак.



Прадстаўнік рамантызму. Дзіцячыя гады прайшлі ў Сляпянцы пад Мінскам. Вучыўся ў езуіцкай школе ў Полацку (1812—13), Віленскім ун-це (з 1818) у Я. Рустэма і Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1824—32) у А. Ягорава і В. Шабуева. Скончыўшы навучанне, прыехаў у Мінск. Меў майстэрню ў Сляпянцы. Аўтар партрэтаў: А. Пушкіна (не закончаны), А. Міцкевіча, А. Гарэцкага, М. Шыманоўскай, К. Ліпінскага (1827), Э. і С. Хамінскіх, А. Травянскага (1837), С. Строганава (мініяцюра, 1831), В. Пуслаўскага і інш.; карцін: «Міцкевіч на скале Аю-Даг» (каля 1831), «Напалеон перад адыходам з Масквы» (1834), «Дзядок, які моліцца» і інш. У 1839 выехаў за мяжу (Дрэздэн, Мюнхен), памёр у Парыжы. Творы В. знаходзяцца ў музеях Ленінграда, Вільнюса, Варшавы, Парыжа і інш. У Дзярж. маст. музеі БССР — партрэт А. Манюшкі.

В. Ваньковіч. Міцкевіч на скале Аю-Даг. Каля 1831. Нацыянальны музей. Варшава.



Літ.: Дробаў Л., В. Ваньковіч — беларускі жывапісец, «Беларусь», 1966, № 7; Ciechanowska Z. Malarz sprawy Walenty Wańkowicz, Warszawa, 1948 (Nadbitka z «Pamiętnika Literackiego», [т.] 38).

Л. Н. Дробаў. Мінск.

ВАНЬКОВІЧ Ян Валенцьевіч (11.10.1838, маёнтак Сляпянка пад Мінскам — 2.8.1899), удзельнік паўстання 1863 на Беларусі. Сын мастака В. *Ваньковіча*. Скончыў лясны ін-т у Пецярбурзе, працаваў лясніком у Екацярынаслаўскай губ., з 1860 у Белавежскай пушчы. У 1861 увайшоў у гродзенскую рэвалюц. арг-цыю, створаную К. Каліноўскім. У час паўстання змагаўся ў атрадах на Падляссі (псеўд. Ляліва). У маі 1863 узначаліў Брэсцкі паўстанцкі атрад і з Кобрынскім атрадам Р. *Траўгута* зрабіў рэйд на Піншчыну. У ліп. 1863 з дапамогай Э. Ажэшкі выехаў у Польшчу, працаваў у паўстанцкай арг-цыі ў Галіцыі. У сак. 1864 арыштаваны аўстр. ўладамі. Пасля жыў у Парыжы, Кракаве.

Літ.: Ciechanowski S. Towarzysz walk Traugutta major Wańkowicz-Leliwa, «Przegląd współczesny», 1925, t. 12, c. 233—242.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

ВАН ЭЙК, гл. *Эйк*.

ВАПНА, вяжучае рэчыва, якое атрымліваецца абпальваннем вапняку ці мелу і складаецца пераважна з вокісу кальцыю. Шчыльн. 340 *кг/м*³, *t* пл. 2585 °С. Мала растваряецца ў вадзе.

Адрозніваюць В. паветраную (мае не больш за 8% гліністы рэчываў), растворы якой цвярдзеюць толькі на паветры, і гідраўлічную (ад 8 да 30% гліністы рэчываў), больш трывалую за паветраную, але менш пластычную, растворы не цвярдзеюць на паветры і ў вадзе. Паветраную В. паводле віду апрацоўкі падзяляюць на нягашаную (CaO) і гашаную [$Ca(OH)_2$]. Нягашаную В., т. зв. кіпелку, атрымліваюць абпальваннем *вапняку*, мелу і інш. карбанатных парод пры т-ры 950—1100 °С у спецыяльных (шахтавых або вярчальных) печах. Бывае камяковая і молатая. Камяковую В. ператвараюць у парашок памолам ці гашэннем вадою. Пры памоле да В. дадаюць карбанатныя пароды, што павялічвае трываласць і вадастойкасць вапнавых буд. растворaў. Пры ўзаемадзеянні нягашанай В. з вадой атрымліваюць гашаную В., т. зв. пушонку (парашок) і цеста. Суспензія гашанай В. ў вадзе наз. вапнавым малаком, а вадзяны раствор яе — вапнавай вадой. Молатая нягашаная В. мае лепшыя ўласцівасці, чым В. гашаная, напр., паскоранае схватванне, зацвярдзенне і сушка, трываласць адпаведных вапнавапясчаных зацвярдзелых растворaў іх (5—50 і 5—10) · 10^5 *н/м*². У залежнасці ад дамешкі вокісу магнію адрозніваюць В. маламагнезіяльную (да 5% MgO), магнезіяльную (да 20%) і высокамагнезіяльную, ці даламітную (да 40% MgO). Паветраная В. шырока ўжываецца ў буд-ве, у вытв. сілікатных аўтаклаўных вырабаў і розных буд. дэталяў, у хім. прамысловасці, металургіі, цукровай, гарбарнай вытв., с. гасп. і інш. Гідраўлічная В. ўжываецца ў буд-ве, а таксама для прыгатавання некат. відаў бетону і растворaў пры муроўцы збудаванняў. Дамешкі сілікатаў, алюмасілікатаў і ферытаў кальцыю надаюць ёй трываласць у вадзе. Бялільную В. (хлорную) атрымліваюць прапусканнем хлору праз водна-вапнавы раствор. Карыстаюцца ёю для бялення баваўняных і льняных тканін. Натронная В.— сумесь гашанай В. з едкім натрыем NaOH — выкарыстоўваецца ў лабараторыях для паглынання вуглякіслага газу.

А. У. Карызна. Мінск.

ВАПНАВАННЕ ГЛЕБЫ, унясенне *вапны* ў глебу для паніжэння яе кіслотнасці. Вапнуюць пераважна падзолістыя, дзярнова-падзолістыя і тарфяныя глебы, якія маюць pH (паказчык кіслотнасці) 5,5 і ніжэй (гл. табл.). У глебавым паглынальным комплексе адбываецца замена іонаў вадароду і алюмінію на іоны кальцыю і магнію. Акрамя паніжэння кіслотнасці, В. г. дае раслінам магчымасць лепей засвойваць пажыўныя рэчывы, выключае шкоднае дзеянне павышанай канцэнтрацыі алюмінію, паляпшае фіз. ўласцівасці глебы, стварае спрыяльныя ўмовы для жыццядзейнасці карысных мікраарганізмаў, узбагачае глебу кальцыем і магніем, робіць больш эфектыўнымі арган. і мінер. ўгнаенні. Вапнуюць глебу ўвесь год. Пры гэтым карыстаюцца глебавай картай і картаграмай кіслотнасці.

Дозы вапны (тон на гектар)

Механічны састаў глебаў	Моцнакіслыя	Сярэднекіслыя			Слабакіслыя	
	pH 4,5 і ніжэй	4,6	4,8	5,0	5,2	5,4—5,6
Супясчаныя і лёгкасуглінкавыя	4,0	3,5	3,0	2,5	2,0	2,0
Сярэднецяжкасуглінкавыя	6,0	5,5	5,0	4,5	4,0	3,5

Дзеянне вапны пры аднаразовым унясенні — 7—10 гадоў. У адпаведнасці з патрэбай раслін да ступені кіслотнасці і вапнавання глебы іх падзяляюць на групы: 1) буракі цукровыя і кармавыя, канюшына чырвоная, люцэрна, баркун (аптымальны pH 6,8—7,5); 2) пшаніца, ячмень, гарох, турнэпс, капуста кармавая, канюшына шведская, лісахвост, каласоўнік, віка, кукуруза (аптымальны pH 6,0—7,5); 3) жыта, авёс, цімафееўка, грэчка (аптымальны pH 5,0—7,0); 4) бульба, лён, сланечнік (аптымальны pH 5,0—6,5); 5) лубін, сырадаля (аптымальны pH 4,5—6,0). У калгасах і саўгасах Беларусі ў 1968 было 5946 тыс. *га* кіслых глебаў (pH 3,5—5,5). За 1965—68 праваппавана 2,3 млн. *га*. З 1971 плануецца штогод вапнаваць глебу на 991 тыс. *га* і ўносіць у сярэднім 4,5 *т/га* дзейнага рэчыва $CaCO_3$, каб нейтралізаваць ¾ гідралітычнай кіслотнасці.

Для вапнавання кіслых глебаў выкарыстоўваецца каля 20 відаў вапнавых угнаенняў. Гал. з іх: даламітавая і вапнавая мука, цэментавы пыл, торфатуфы, адходы цукр. заводаў. Ва ўмовах Беларусі найб. ужываецца даламітавая мука, у якой, акрамя кальцыю, ёсць магній, каштоўны для большасці глебаў Беларусі. Яна таксама нейтралізуе фізіялагічна кіслыя мінер. ўгнаенні.

Літ.: Краткий справочник по известкованию кислых почв, Мн., 1966; Рекомендации по известкованию почв, М., 1965; Аллямовский Н. И. Известковые удобрения в СССР, М., 1966.

Я. А. Басалыга. Мінск.

ВАПНАЎКА (Gypsophila), род адна- і шматгадовых травяністых раслін, радзей кустоў сям. гваздзічных. Сцябло прамастойнае або распасцёртае ці прыўзнятае, выш. да 100 (170) *см*. Лісце сядзячае лінейнае. Кветкі дробныя, белыя або ружовыя. Плод — каробачка. Вядома каля 140 відаў, пашыраных у Еўропе і Азіі (адзін від у Аўстраліі). У СССР каля 70 відаў, у БССР 3. Найб. вядомыя В. пучкаватая (G. fastigiata) і В. мяцёлчатая (G. paniculata). Растуць каля дарог, у хвойных лясах, на сфагнавых балотах. Карані В. мяцёлчатай маюць да 30% сапанінаў і вядомыя пад назвай «белага мыльнага кораня». Іх можна выкарыстоўваць як сурагат мыла (для мыцця воўны), на выраб шампуняў, мыльнага парашку. У жывёлы можа выклікаць атручэнне. В.— добры меданос. Выкарыстоўваецца ў дэкар. садоўніцтве.

ВАПНЯК, асадкавая горная парода з карбанатаў кальцыю $CaCO_3$ (кальцыт, араганіт). Утрымлівае прымесі (у чыстых рознасцях да 5%) мінералу даламіту $MgCO_3$, гліністага матэрыялу, крамянязёму, вокісаў жалеза, пясчаных часцінак і інш.

Паводле паходжання В. бываюць: 1) арганагенныя — з ракавін (ракушачнікі) або з калоній каралаў, імшанак, водарасцей (рыфавыя В.); 2) арганагенна-абломкавыя (дэтрытусавыя) — з абломкаў арганічных рэштак; 3) абломкавыя — з абкатаных карбанатных зерняў рознага памеру; 4) хемагенныя; 5) перакрышталізаваныя. Сярод апошніх адрозніваюць груба- (2,0—1,0 *мм*), буйна- (1,0—0,5 *мм*), сярэдне- (0,5—0,25 *мм*), дробна- (0,25—0,10 *мм*), тонка- (0,1—0,01 *мм*) і скрытакрышталічныя, або афанітавыя (<0,01 *мм*). В. звязаны паступовымі пераходамі з інш.ародамі. Пры павелічэнні колькасці $MgCO_3$ праз даламіцістыя і даламітавыя вапнякі пераходзіць у даламіт, падобны з выгляду на В. Маюе пераходы праз гліністы ВВ., мергелі (50—75% $CaCO_3$) да глінаў, праз пясчаністы і пясчаны В. да вапняковістых пясчанікаў. Пры метамарфізме пераходзіць у *мармур*.

Колер пароды белы або шэры з рознымі адценнямі. Большасць В. марскога паходжання, але ёсць прэснаводныя В. азёраў, В. засалапёных поймаў і крыніц (вапняковыя туфы), другасныя В. Ужываецца ў будаўніцтве, вытв. вяжучых матэрыялаў (*вапна, цэмент*), металургіі (флюсы), у мастацтве (матэрыял для скульптур), архітэктуры (дэкарацыйна-арнаментальныя работы), у сельскай гаспадарцы (*вапнаванне глебы*).

М. В. Вераценнікаў. Мінск.

ВАПЦАРАЎ Нікола Іонкаў [24.11(7.12). 1909, Банска — 23.7.1942], балгарскі паэт. Чл. Балг. кампартыі з 1934. Сын македонскага рэвалюцыянера. Скончыў марское тэхн. вуч. (1932); працаваў качагарам, тэхнікам. За рэвалюц. дзейнасць В. няраз арыштоўвалі. Расстраляны гітлераўцамі за антыфаш. барацьбу. Друкавацца пачаў у 1926. Пры жыцці выйшаў зб. «Маторныя песні» (1940). Паэзія В. спалучае страснае сцвярджэнне сацыяліст. ідэалу і гнеўнае адмаўленне капіталіст. грамадства. Засвоіўшы дасягненні рэвалюц. балг. лірыкі, традыцыі нар. паэзіі і ўзоры сав. л-ры, выступіў як паэт-наватар: узбагаціў балг. паэзію новымі тэмамі і вобразамі, стварыў канкрэтны, жыццёвы вобраз рабочага-камуніста. Творча развіў прынцыпы сацыяліст. рэалізму ў балг. л-ры. Ганаровая Міжнар. прэмія міру (1953, пасмяротна). На бел. мову вершы В. перакладалі Н. Гілевіч, А. Астрэйка і інш.

Тв.: Съчинения, София, 1969; бел. пер.— у кн.: Ад стром балканскіх, Мн., 1965; рус. пер.— Стихотворения, М., 1959.

Літ.: Никола Вапцаров. Биобиблиогр. указатель, М., 1953.

ВАРАБ'ЁЎ Іван Аляксеевіч (н. 26.8.1921, в. Гарбачова Адоеўскага пав. Тульскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў ваенна-авіяц. школу ў Тамбове (1941), Ваен.-паветр. акадэмію (1952). На фронце з жн. 1942 у палку начных бамбардзіроўшчыкаў, з 1943 лётчык-

штурмавік. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Севастопалем, разгрому гітлераўскай дывізіі СС «Мёртвая галава»; в 1944 экіпаж В. ў складзе 3-га Бел. фронту пад Оршай. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Літвы, у баях ва Усх. Прусіі. Зрабіў каля 400 баявых вылетаў. Служыць у Сав. Арміі.

ВАРАБ'ЁЎ Рыгор Цімафеевіч [н. 15(28).11. 1910, в. Малы Мелік Саратаўскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1942. З чэрв. 1941 удзельнік баёў на Зах. фронце. З мая 1942 камандзір роты ў *партызанскай брыгадзе імя В. П. Чкалава* ў Валожынскім р-не. У маі 1943 накіраваны ў Лідскі р-н. Са студз. 1944 камандзір *партызанскай брыгады імя К. К. Ракасоўскага* Баранавіцкай вобл. Пасля вызвалення Беларусі на сав. рабоце ў Слоніме. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ВАРАБ'ЁЎ Уладзімір Пятровіч [15(27).6. 1876, Адэса — 31.9.1937], савецкі вучоны ў галіне анатоміі. Акад. АН УССР (1934). Адзін са стваральнікаў функцыянальна-дынамічнага кірунку ў анатоміі. Прапанаваў арыгінальныя метады даследаванняў: стэрэамарфалогію, макра- і мікраскапію. Вывучаў вегетатыўныя нервовыя вуалы і сплятанні, інервацыю сэрца, страўніка і інш. З праф. Б. І. Збарскім удзельнічаў у бальзамяванні цела У. І. Леніна. Аўтар арыгінальнага 5-томнага «Атласа анатоміі чалавека» (1938—42). Прэмія імя У. І. Леніна (1927). Узнаг. ордэнам Леніна.

Тв.: Избр. труды, Л., 1958 (бібліягр. прац В.).
Літ.: Владимир Петрович Воробьев. Библиогр. указатель, Харьков, 1957.

ВАРАВА Уладзімір Аляксеевіч [14(26).7. 1895, в. Вялікія Жухавічы Навагрудскага пав.— 4.5.1929], беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Чл. КПЗБ з 1923. У 1920 працаваў у Жухавіцкім валрэўкоме Навагрудскага пав., потым у Наркамземе БССР і вучыўся ў Мінскім палітэхнікуме. У 2-й пал. 1921 выехаў у Зах. Беларусь, вёў падпольную работу. Некалькі разоў арыштоўваўся. Друкаваўся ў зах.-бел. газетах, часопісах і падпольных выданнях КПЗБ. Рэдагаваў газ. «Жыццё беларуса». У ліст. 1925 вярнуўся ў БССР. Быў нам. рэдактара слуцкай акр. газ. «Вясковы будаўнік», працаваў у Мінскім акр. земельным аддзеле. Чл. *«Беларускай літаратурнамастацкай камуны»*. Пісаў вершы, апавяданні, нарысы, фельетоны (псеўд. Дзядок), у якіх выкрываў мяшчанства, паказваў класавую барацьбу ў вёсцы, кулацкі тэрор, ахвярай якога стаў сам.

Тв.: Падхалім, «Росквіт», 1927, № 1.
М. І. Каміскі. Мінск.

«ВАРАГ», крэйсер рускага флоту, які на чале з капітанам 1-га рангу У. Ф. Рудневым гераічна змагаўся (разам з канонерскай лодкай «Карэец») у пяроўным баі супраць японскай эскадры каля Чэмульпо 27.1(9.2).1904 у руска-японскую вайну. Экіпажы крэйсера і канонеркі «Карэец» узарвалі лодку і ўтапілі пашкоджаны «В.», каб іх не захапілі японцы.

Літ.: Пономарев И. И. Герои «Варяга», М., 1954; Степанов А. Порт-Артур, кн. 1, М., 1960.

ВАРАГІ (ад стараж.-сканд. vaeringjar), старажытнарускае і візантыйская назва скандынаваў *(нарманаў)*.

Дружыны В. на чале з князямі (конунгамі) з'явіліся ў 9 ст. ва Усх. і Зах. Еўропе. У 9—11 ст. В. наймаліся на службу да рус. князёў, удзельнічалі ў паходах супраць Візантыі і вандроўных плямёнаў, гандлявалі па *шляху з «варагаў у грэкі»*. Большасць В. успрыняла мову і культуру усх. славян. У рус. крыніцах В. ўпершыню ўзгадваюцца ў «Аповесці мінулых часоў», дзе летапісец пачынае гісторыю зямлі рускай запрашэннем В. на Русь. На аснове гэтай легенды ў 18 ст. ўзнікла антынавуковая нарманская тэорыя паходжання Русі, якая прыпісвае В. ролю стваральнікаў старажытнарускай дзяржавы. Сав. гістар. навука даказала неабгрунтаванасць гэтай тэорыі.

Літ.: Рыбаков Б. А. Предпосылки образования древнерусского государства, у кн.: Очерки истории СССР. III—IX вв., М., 1958; Шасколький И. П. Норманская теория в современной буржуазной историографии, «История СССР», 1960, № 1.

ВАРАЖБА, прыёмы і дзеянні, з дапамогай якіх прымхлівыя людзі імкнуліся даведацца пра сваю будучыню. Узнікла ў эпоху першабытнага ладу. Вядома В. па картах, снах, лініях рукі (*хіраманты*я) і рысах твару, на вадзе, зернях, арэхах, кававай гушчы, костках і інш. У славян прарочымі лічыліся сава, сыч, варона, курыца. На каляды варажылі з люстэркам, лілі воск ці волава ў ваду. Некаторыя віды В. асталіся да нашых дзён як неражытак мінулага.

ВАРАЖСКАЕ АБЛЕДЗЯНЕННЕ (беларускае абледзяненне), першае раўніннае, самае старажытнае абледзяненне на тэрыторыі Беларусі. Вылучана М. М. Цапенка ў 1957 пад назвай «абледзяненне першай паловы старажытнай эпохі» антрапагену, у 1966 названа ёю «першым ніжнеантрапагенавым беларускім абледзяненнем». У стратыграфічнай схеме чацвярцічных адкладаў Беларусі і Прыбалтыкі (1957) паз. ніжнебярэзінскім. Л. М. Вазнячук у 1966 даў назву В. а. Адпавядае першаму міндэльскаму абледзяненню альпійскай шкалы ў Зах. Еўропе. Паўд. мяжа В. а. (паводле М. М. Цапенка і Б. В. Шавякова, 1959) праходзіць на Пд ад Маларыты, на Пн ад Пінска, на ПнЗ ад Ганцавіч, на ПдЗ ад Капыля праз Глуск, Бабруйск, на Пн ад Быхава праз Чавусы і Дрыбін.

Марэна складзена з валунных суглінкаў і супескаў шэрага і зеленавата-шэрага колеру з дамешкай (да 5—10%) жвіру, галькі і валуноў большай часткаю з мясцовых асадкавых парод. Адклады В. а. пашыраны на маранных раўнінах (магутнасць 5—10, радзей да 20 *м*), у паніжэннях даантрапагенавага рэльефу (да 60 *м*), асабліва ў лагчынах ледавіковага выворвання. Наяўнасць магутнай марэны ў апошніх сведчыць пра тое, што ледавік быў актыўны, моцна дзейнічаў на падсподнія адклады, выворваў у іх глыбокія лагчыны (ледавіковая экзарацыя), выварочваў з іх глыбокіх розных памераў *(адорвені)*, валок іх на вялікую адлегласць і пакідаў разам з марэнай. Самаму старажытнаму В. а. звычайна надаюць пліяценавы ўзрост, гюнцкі і нават акчагыльскі (А. І. Маскіцін). Але на Беларусі (на правым беразе Нёмана вышэй Гродна каля в. Сіўкава) ніжнеантрапагенавыя адклады, уключаючы варажскую марэну, залягаюць на верхнепліяценавых пародах, блізкіх узростам да кінельскай світы акчагыльскага яруса (паводле даследаванняў П. І. Дарафеева, 1967).

Літ.: Цапенко М. М. и Махнач Н. А. Антропогеновые отложения Белоруссии, Мн., 1959.
Г. І. Гарэцкі. Мінск.

ВАРАЖЦОЎ Мікалай Мікалаевіч [н. 24.5(6.6).1907, Томск], савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1958). Чл. КПСС з 1942. З 1958 дырэктар Новасібірскага ін-та арган. хіміі Сібірскага аддз. АН СССР. Асн. кірунак прац В. хімія аранатычных злучэнняў: механізмы рэакцый ізамерызацыі араматычных злучэнняў, рэакцыі нуклеафільнага замяшчэння галагенаў, сульфа- і нітрагруп, метады сінтэзу араматычных фторвытворных злучэнняў. Па тэхналогіі, прапанаванай В., прамысловасць выпрабляе шэраг хім. прадуктаў. Дзярж. прэмія СССР 1952. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Літ.: Николай Николаевич Ворожцов, «Известия Сибирского отделения АН СССР. Сер. химических наук», 1967, № 7, в. 3.

ВАРАКСІН Уладзімір Мікалаевіч [н. 22.6 (5.7).1901, Омск], беларускі савецкі архітэктар, педагог. Вучыўся ў Ленінградскім ін-це інжынераў камунальнага буд-ва (1932—34) у С. Серафімава. З 1934 працаваў у Мінску, у 1941—43 у Ніжнім Тагіле і Омску. Пасля Айч. вайны вярнуўся ў Мінск, удзельнічаў у рэканструкцыі бел. гарадоў. З 1937 выкладчык, з 1954 дац. кафедры архітэктуры Бел. політэхн. ін-та. Сярод будынкаў даваеннага часу: Дом Саветаў у Слуцку (1937—39, разбураны ў 1941), пед. тэхнікум у Крычаве (1938), кінатэатр «Радзіма» ў Магілёве (1939), клуб запалкавай ф-кі ў Рэчыцы (1939), жылы пасёлак аўтарамонтнага завода ў Магілёве (1940—41). Найб. вядомыя ў Мінску: Палац піянераў (1935—36), будынак ЦК КПБ (1940—41, закончаны ў 1947; абодва з А. Воінавым). Сярод работ апошняга часу: гал. машынная зала электрастанцыі (1945) і кінатэатр імя Калініна (1950) у Гомелі; будынак абкома КПБ (1952) у Гродне; Белкамунбанк (1950), Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1954), жылыя дамы па вул. К. Маркса, Маскоўскай, Захарава (1949—55) у Мінску.

ВАРАКУШКА (Luscinia svecica), птушка атр. вераб'іных. Даўж. каля 15 *см*, сярэдняя маса 17 *г*. Згрэбная, з своеасаблівым колерам апярэння (спалучэнне шэрага, бураватага, белага і сіняга). Пашырана ў Паўн. Еўропе і Азіі, на зіму адлятае ў Паўд. Азію і Афрыку. У СССР трапляецца ўсюды, акрамя стэпаў і пустыняў. Селіцца пераважна ў хмызняках, па берагах рэк і азёраў. Трымаецца скрытна. Падвід, пашыраны ў БССР (сярэднееўрапейская В.), прылятае ў 1-й пал. красавіка. 2 разы за год лінае па 4—7 аліўкавых яец. Корміцца насякомымі. Адлятае позняй восенню. Карысная для лясной гаспадаркі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Птушкі*.

ВАРАНЁННЕ, атрыманне на паверхні стальных і чыгунных вырабаў ахоўнай вокіснай плёнкі. Сталь набывае чорны колер з фіялетавым адценнем. В. робяць пры ахоўна-дэкаратыўнай апрацоўцы дэталяў зброі, станкоў, прылад. На з-дах Беларусі выкарыстоўваецца для апрацоўкі паверхні многіх відаў вырабаў.

Раней В. рабілі награваннем дэталяў да 265—275 °С і праціркай іх паверхні рыззём, змочаным у канапляным алеі. У сучаснай вытворчасці практыкуецца шчолачнае, кіслотнае і тэрмічнае В. Гл. таксама *Аксідаванне металаў*.

Літ.: Бахвалов Г. Т. Защита металла от коррозии, М., 1964.

ВАРАНЕЦКІ Андрэй Максімавіч (н. 19.2. 1920, в. Дубраўка Ігуменскага пав. Мінскай губ.), гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1949. Скончыў Мінскі настаўніцкі ін-т (1940). Удзельнік Айч. вайны. У 1946—53 настаўнічаў у Гродзенскай вобл. З 1953 старшыня калгаса *«Гвардыя»* Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. На XXVI з'ездзе КПБ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Тв.: Выкарыстоўваем усе рэзервы. Мн., 1962; Высокая награда обязывает. Мн., 1968.

ВАРАНІ, вёска ў Столінскім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Гарынь (3 *км*). Падпарадкоўваецца Рэчыцкаму пасяльковаму Савету. Цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». За 12 *км* на Пд ад Століна, 277 *км* ад Брэста, 5 *км* ад чыг. ст. Гарынь. 1497 ж., двароў 420 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У Айч. вайну вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 70 жыхароў.

ВАРАНІЛАВІЧЫ, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Зара». За 45 *км* на ПнУ ад Пружан, 140 *км* ад Брэста, 30 *км* ад чыг. ст. Іванцэвічы. 452 ж., двароў 131 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, швейная майстэрня. Помнік партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ВАРАНІНО, пасёлак ў Следзюкоўскім с/с Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр саўгаса «Варанінo». За 8 *км* на ПнУ ад Быхава, 40 *км* ад Магілёва, на шашы Магілёў — Гомель. 778 ж., гасп. 229 (1970). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання, лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад і яслі, адда. сувязі, станоўая, 3 магазіны, стадыён, Абеліск славы, помнік Герою Сав. Саюза Ф. А. *Смалячкову*.


ВАРАНІХІН Андрэй Нічыпаравіч [17(28).10. 1759, с. Новае Усолле Пермскай губ.— 21.2 (5.3).1814], рускі архітэктар эпохі класіцызму. Да 1786 прыгонны графа А. С. Строганава. У Маскве браў урокі архітэктуры (у В. Бажэнава і М. Казакова), займаўся жывапісам. У 1797 атрымаў званне акадэміка перспектыўнага жывапісу, у 1800 званне архітэктара.



У 1811—14 праф. Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Раннія работы В.— дача Строганава на Чорнай рэчцы ў Пецярбурзе (1795—96, разабраная ў пач. 20 ст.), дом-сядзіба Гарадня (Калужская губ.), павільёны-каланады ў Пецяргофе — вызначаюцца стрыманым убраннем, прыгажосцю. Гал. работы ў Пецярбурзе: Казанскі сабор (1801—11) і Горны ін-т (1806—11). Архітэктуры сабора ўласціва стройнасць прапорцый, што стварае ўражанне ўрачыстасці і велічы. Новы горадабудаўнічы падыход В. выявіўся ў аб'яднанні сабора і каланады ў адно цэлае з плошчай. Будынак Горнага ін-та з гладкімі сценамі і манументальным, суровым грэка-дарычным порцікам быў пастаўлены на беразе Нявы і пазначаў уезд у сталіцу ад мора. В.— майстар інтэр'ера і малых арх. формаў (агароджа плошчы на захад ад Казанскага сабора, 1811, і інш.).

Літ.: Гримм Г. Г. Архитектор Воронихин, М.—Л., 1963; Панов В. А. Архитектор А. Н. Воронихин, М., 1937.

ВАРАНІШЧА Фадзей Канстанцінавіч [н. 1 (14).12.1907, в. Клідзяняты Ашмянскага пав. Віленскай губ.], удзельнік рэвалюц. руху ў Аргенціне і Іспаніі, Руху Супраціўлення ў Францыі. З сялян. Чл. КПСС з 1968. У 1928 эмігрыраваў з Зах. Беларусі ў Аргенціну. З 1932 чл. кампартыі Аргенціны. У Буэнас-Айрэсе быў фін. сакратаром Саюза ўкраінскай і беларускай рэвалюц. арг-цыі (СУБРА), якая працавала пад кіраўніцтвам кампартыі; арганізоўваў збор сродкаў у фонд дапамогі рэсп. Іспаніі, паліт. вязням, дэмакратычнай бел. і ўкр. прэсе. У 1937—39 добраахвотнік рэсп. войск Іспаніі, камандзір узвода інтэрнац. брыгады імя Я. Дамброўскага, чл. кампартыі Іспаніі. У 2-ю сусв. вайну ўдзельнік Руху Супраціўлення ў Францыі. З 1945 на радзіме, у Смаргоні. На памяць пра сумесную барацьбу з фашызмам камуністы г. Бардо перадалі В. сцяг, які напярэдадні 2-й сусв. вайны франц. рабочым уручылі працоўныя Масквы. Сцяг зберагаецца ў Гродзенскім абл. краязнаўчым музеі. В.— прататып гал. вобраза рамана Я. Р. Басняцкага «Іншаземец».



Літ.: Рассказы о наших земляках, Молодечно, 1959, с. 166—172.

ВАРАНОВІЧ Іосіф Робертавіч (н. 3.12.1928, мяст. Гайна Лагойскага р-на Мінскай вобл.), беларускі савецкі вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі. Д-р мед. н. (1969). У 1953 скончыў Мінскі мед. ін-т. З 1953 у НДІ траўматалогіі і артапедыі ў Мінску (навук. супрацоўнік, заг. аддзялення). Асн. працы па лячэнні пераломаў. Аўтар новага спосабу лячэння пераломаў мышчалкаў сцягновай і вялікагалёначнай касцей з дапамогай спіц і клямра без ускрыцця каленнага сустава.

Тв.: Боковой компрессионный остеосинтез при внутрисуставных переломах костей коленного сустава, у кн.: Труды I Всесоюзного съезда травматологов-ортопедов, М., 1965; О лечении повреждений связочного аппарата коленного сустава, «Ортопедия, травматология и протезирование», 1966, № 3; (разам з Грыгор'евым Л. Я.) Остеосинтез металлическими спицами, Мн., 1969.



ВАРАНОЎКА, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл. Падпарадкоўваецца Воранаўскаму пасялковаму Савету. Цэнтр саўгаса «Воранаўскі». За 0,3 *км* на Пд ад Воранава, 137 *км* ад Гродна, на шашы Ліда—Вільнюс. 351 ж., двароў 111 (1970). Адд. Сельгастэхнікі. Школа-інтэрнат.

ВАРАНЦОЎ Аляксандр Нічыпаравіч [н. 9 (22).9.1907, в. Пань-Буда Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. У Чырв. Арміі з чэрв. 1941. Наводчык станковага кулямёта. Удзельнік абароны Масквы. Зімою 1942/43 удзельнічаў у 42-дзённым рэйдзе па тылах ворага ў раёне Ржэў — Сычоўка — Нялідава. У вер. 1943 у ліку першых фарсіраваў Дзяспну і на захопленым плацдарме адбіў 2 контратакі непрыяцеля. Удзельнік вызвалення Польшчы, баёў у Германіі. Жыве на радзіме.

ВАРАНЦОЎ Васіль Паўлавіч (псеўданім В. В.; 1847—1918), рускі эканаміст і публіцыст, ідэолаг ліберальнага народніцтва. У працах «Лёс капіталізму ў Расіі» (1882), «Прагрэсіўныя плыні ў сялянскай гаспадарцы» і інш. сцвярджаў, што развіццё капіталізму ў Расіі немагчыма, ідэалізаваў сялянскую абшчыну, абараняў дробную таварную вытворчасць. Выступаў супраць марксізма. Рэакц. погляды В. выкрыў і крытыкаваў У. І. Ленін.

Літ.: Ленін У. І. Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); яго ж. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (там жа, т. 3).

ВАРАНЦЭВІЧЫ, вёска ў Воўкавіцкім с/с Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Камсамольская праўда». За 17 *км* на У ад Талачына, 133 *км* ад Віцебска, 14 *км* ад чыг. ст. Талачын. 235 ж., двароў 97 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, магазін.

ВАРАНЧУК Андрэй Якаўлевіч [н. 2(15).6. 1915, мяст. Горваль Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Рэчыцкі пед. тэхнікум (1932), працаваў загадчыкам пачатковай школы. У 1938 пайшоў у Чырв. Армію. Скончыў



Куйбышаўскую паліт-школу (1939). Удзельнік баёў з яп. захопнікамі на р. Халхін-Гол (1939). У Айч. вайну на фронце з 1941. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызвалення Украіны. Вызначыўся 15—17.10.1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. У час пераправы сав. часцей батарэя, якою камандаваў В., знішчыла 5 варожых агнявых кропак, фарсіравала раку, захапіла плацдарм, адбіла 4 контратакі ворага. Жыве ў Кіеве.

ВАРАНЬКО Платон Мікітавіч [н. 18.11 (1.12).1913, в. Чарнеччына Ахтырскага пав. Харкаўскай губ.], украінскі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1943. З сям'і каваля. Скончыў Харкаўскі аўтадарожны тэхнікум (1932). Настаўнічаў, вучыўся ў Літ. ін-це імя М. Горкага. У Айч. вайну камандаваў партыз. атрадам (партызаніў і на Беларусі). Першы зб. «Карпацкі рэйд» (1944). Асн. тэмы твораў: подзвігі партызанаў, пасляваен. буд-ва (зб. «Добрай раніцы», «Славен мір», 1950, Дзяржпрэмія СССР 1951; «Цяпло зямлі маёй», 1959), дружба народаў (зб. «Мая Гуцульшчына», 1956; «Гневан Афрыка кіпіць», 1961), дзіцячы свет (зб. «Чытаначка», 1951; «Аніся», 1954; «Ярык-шкалярык», 1958). На словы В. напісана больш за 50 песень. Узнаг. 6 ордэнамі, медалямі. Літ. прэмія імя М. Астроўскага (1959).

Тв.: Твори, т. 1—2, Київ, 1963; бел. пер.— Твая кніжка, Мн., 1954; Хлопчык Памагай, Мн., 1958; рус. пер.— Киевские клены, М., 1963.

Літ.: Сердюк П. Платон Воронько, Київ, 1963.

ВАРАНЯНСКІ Васіль Трафімавіч (25.8.1901, в. Дзіканька Палтаўскага пав.— вер. 1943), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Палтаўскае фельчарскае вуч. (1919). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны, баёў у раёне возера Хасан (1938). У вер. 1941 арганізаваў і ўзначаліў партыз. групу, якая выросла ў партыз. атрад. З вер. 1942 камандзір *партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы»* ў Мінскай вобл. Пасля смерці В. брыгада названа яго імем. Загінуў у час пералёту цераз лінію фронту. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі. Яго імем названы вуліцы ў Мінску і ў г. п. Плешчаніцы.

ВАРАПАЕВА, гар. пас. (з 1949) у Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., за 28 *км* на ПнУ ад Паставаў, за 238 *км* ад Віцебска. Чыг. станцыя. Цэнтр саўгаса «Варапаева». 4,2 тыс. ж. (1969). З-д жалезабетонных вырабаў, прамкамбінат, камбікормавы з-д, хлебакамбінат. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, муз. школа, дзіцячы сад і яслі, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца, паліклініка. Помнік У. І. Леніну. Помнік на брацкай магіле 143 сав. воінаў і партызанаў і абеліск землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

Варапаева. Агульны выгляд.



ВАРАПАЕЎ Іван Кірылавіч [7(20).4.1905, в. Трубільня Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 11.11.1959], Герой Сав. Саюза (1944), ген.-м. артылерыі (1944).



З сялян. Чл. КПСС з 1928. З 1924 працаваў на з-дах Гомеля і Нова-Беліцы. У Чырв. Арміі з 1927. Скончыў Вышэйшую ваен. акадэмію (1946). Удзельнік баёў у Іспаніі. У Айч. вайну на фронце з чэрв. 1941. Камандаваў артыл. палком, артылерыяй дывізіі і корпуса. Удзельнік баёў пад Сталінградам, вызвалення Беларусі, Украіны, Польшчы. Вызначыўся пры фарсіраванні Віслы. Артыл. агнём забяспечыў пераправу сав. часцей. За месяц наступальных баёў артылерыя корпуса, якою камандаваў В., знішчыла 106 варожых танкаў і самаходных гармат, 172 мінамёты і гарматы.

ВАРАТЫНІЧЫ, вёска ў Гарадзецкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Мухавец. Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 25 *км* на У ад Кобрына, 76 *км* ад Брэста, 11 *км* ад чыг. ст. Гарадзец. 322 ж., гасп. 107 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі расстралялі 11 жыхароў вёскі.

ВАРАТЫНЦАЎ Мікалай Піліпавіч (н. 21.5. 1924, в. Макрэц Ніжнедзявіцкага пав. Варонежскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1946. У Чырв. Арміі са жн. 1942. Вызначыўся ў баях за вызваленне Віцебшчыны. 24.6.1944 адзін з першых фарсіраваў Зах. Дзвіну каля в. Узрэчча Віцебскай вобл. і агнём з кулямёта прыкрываў пераправу свайго батальёна. Жыве ў Прыазоўскім р-не Запарожскай вобл.

ВАРАТЫНЬ, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Ала (400 *м*). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Пушкіна. За 36 *км* на ПдУ ад Бабруйска, 160 *км* ад Магілёва, 1,5 *км* ад чыг. ст. Амельня. 390 ж., двароў 123 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1931 забіты кулакамі сакратар першай камсам. арг-цыі Варатынскага с/с С. Ф. Парахневіч. Помнік на брацкай магіле 7 сав. воінаў і партызанаў. Сярод на-

хаваных Герой Сав. Саюза І. Я. *Арол.* Помнік 227 жыхарам В. і навакольных вёсак, якія загінулі ў барацьбе з нім. фашыстамі.

ВАРАЦ Домна Іванаўна (н. 14.1.1909, в. Княжаводцы Гродзенскага пав.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). З 1939 у калгасе «1 Мая» Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. У 1948—69 цялятніца калгаса імя Адама Міцкевіча Мастоўскага р-на.

ВАРАЦІШЧА, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 25 *км* на ПдЗ ад Стоўбцаў, 92 *км* ад Мінска, 11 *км* ад чыг. ст. Гарадзея, каля шашы Мінск — Брэст (1,5 *км*). 199 ж., двароў 69 (1970). Магазін.

ВАРАЦЭВІЧЫ, вёска ў Гарбахскім с/с Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса імя Крупскай. За 12 *км* на ПдЗ ад Іванава, 128 *км* ад Брэста, 7 *км* ад чыг. ст. Снітава. 977 ж., двароў 286 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі. У часы бурж. Польшчы з 1924 у В. дзейнічала падпольная арг-цыя КПЗБ. Абеліск 48 аднавяскоўцам — воінам і партызанам Вял. Айч. вайны.

ВАРАШБІЛАЎ Клімент Яфрэмавіч [23.1 (4.2).1881, с. Верхняе Бахмуцкага пав. Екацярынаслаўскай губ.— 2.12.1969], савецкі парт., дзярж. і ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1935). Двойчы Герой Сав. Саюза (1956, 1968). Герой Сац. Працы (1960). З сям'і рабочага. Чл. КПСС з 1903. З 1896 рабочы на Юр'еўскім металург. з-дзе. З 1903 у Луганску на паравозабудаўнічым з-дзе. У 1904 чл. Луганскага бальшавіцкага к-та. З 1904 да 1917 вёў падпольную парт. работу ў Луганску, Баку, Пецярбурзе, Царыцыне. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. Дэлегат IV (1906) і V (1907) з'ездаў РСДРП. У 1907—14 у турмах і ссылках. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. Петраградскага Савета, дэлегат VII (Красавіцкай) Усерасійскай канферэнцыі і VI з'езду РСДРП(б). З сак. 1917 старшыня Луганскага Савета рабочых дэп. і гарадской думы. Актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У снеж. 1918 нарком унутр. спраў Украіны. У грамада. вайну камандаваў 5-й укр. арміяй, Царыцынскім фронтам, 10-й арміяй; чл. РВС, адзін з арганізатараў 1-й Конпай арміі. У 1921—25 камандуючы войск Паўн.-Каўказскай і Маскоўскай ваен. акруг. З 1925 нарком абароны СССР. З 1940 нам. Старшыні СНК СССР і старшыня К-та абароны пры СНК СССР. У Айч. вайну чл. Дзярж. к-та абароны, галоўнакамандуючы войск Паўн.-Зах. напрамку, упаўнаважаны Стаўкі. У 1945—47 старшыня Саюзнай кантрольнай камісіі ў Венгрыі. У 1946—53 нам. Старшыні Савета Міністраў СССР. З сак. 1953 да мая 1960 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета СССР. На X—XXIII з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. У 1926—52 чл. Палітбюро, у 1952—60 чл. Прэзідыума ЦК КПСС, з мая 1960 чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—7-га скл. Узнаг. 8 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, ганаровай рэвалюц. зброяй, ордэнамі замежных краін. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.



Тв.: Оборона СССР. Избр. ст., речи и письма, М., 1937; Рассказы о жизни. (Воспоминания), кн. 1, М., 1968.

ВАРАШЫЛАЎГРАД (да 1935 і ў 1958—69 Луганск), горад, цэнтр Варашылаўградскай вобл. УССР, на р. Лугань (прыток Северскага Данца). Чыг. вузел, аэрапорт, 382 тыс. ж. (1970).


14.11.1795 на месцы будучага горада заснавалі першы на Пд Расіі доменны ліцейна-гарматны з-д. З 1882 павятовы горад Екацярынаслаўскай губ. Першы с.-д. гурток узнік у 1900, арг-цыя РСДРП у 1902. У 1905 створаны адзін з першых у краіне Савет рабочых дэпутатаў, якім кіравалі бальшавікі. Сав. ўлада ўстаноўлена 25.10(7.11).1917. Старшынёй Луганскага Савета выбраны К. Я. *Варашылаў.* У 1924 за заслугі ў барацьбе супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў В. узнаг. ордэнам Чырв. Сцяг. У Вял. Айч. вайну з 19.6.1942 да 14.2.1943 акупаваны і разбураны нім.-фаш. захопнікамі.

Гал. галіны прамысловасці: машынабудаванне і металаапрацоўка, прамысл. буд. матэрыялаў, харч. і лёгкая. У В. 84 прамысл. прадпрыемствы. Найважнейшыя: цеплавозабуд. з-д імя Кастр. рэвалюцыі, горнага абсталявання імя Пархоменкі (абсталяванне шахтаў), трубапракатны з-д (стальныя і чыгунныя трубы), з-д па вытв. напільнікаў, машынабудаўнічы імя 20-годдзя Кастрычніка, ліцейна-механічны, акумулятарны, з-д імя Арцёма (сан.-тэхн. абсталяванне і эмаліраваны посуд), хіміка-фармацэўтычны. Прадпрыемствы па вырабе інструментаў, радыятараў. Вытв. цэменту, цэглы, жалезабетонных канструкцый. Харчовая (мясакамбінат, кандытарская і макаронная ф-кі, мукамольны камбінат, малочны з-д), лёгкая (тонкасуконны камбінат, абутковая ф-ка) прамысл. Ін-ты: машынабуд., с.-г., мед., пед., 13 сярэдніх спец. навуч. устаноў, 2 тэатры, філармонія. 2 музеі (мастацкі і краязнаўчы).

Літ.: Луганск. Исторический очерк. Донецк, 1969.

ВАРАШЫЛАЎГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (з 1958 да 1970 Луганская вобласць), у складзе УССР. Утворана 3.6.1938. Размешчана ў паўд.-ўсх. частцы рэспублікі ў сярэднім цячэнні Северскага Данца. Пл. 26,7 тыс. км². Нас. 2749 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 18 раёнаў; 34 гарады, 98 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Варашылаўград.

Паверхня В. в.— хвалістая раўніна, расчлянёная густой сеткай яроў і лагчын. На Пд вобл.— Данецкі кряж выш. да 367 *м* (г. Магіла-Мячатная). Карысныя выкапні: кам. вугаль, вапняк, мергель, мармур, вогнетрывалыя і пластычныя гліны, пясчыстыя сланцы, кам. соль, поліметалічныя руды. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад —6 на Пд да —8 °С на ПнУ, ліп. ад 21,8 на ПнЗ да 23,1 °С на ПдУ. Ападкаў за год ад 410—420 *мм* на ПнУ да 500 *мм* на Данецкім кражы. Гал. рака Северскі Данец з прытокамі Краснал, Баравая, Айдар, Дверкуд, Луганьчык. Міус. Глебы чарназёмныя, дзярнова-лугавыя і ападзоленыя, у рачных поймах алювіяльныя. В. в. размешчана ў стэпавай зоне. Стэп амаль усюды разараны. У Белаводскім р-не астаўся масіў дубовага лесу, закладзенага В. В. Дакучаевым.



Асн. насельніцтва Украіны і рускія. Жывуць беларусы, палякі, малдаване. Сярэдняя шчыльн. 103 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 83% (1970). Гарады: Варашылаўград, Кадзіеўка, Камунарск, Лісічанск, Красны Луч і інш.

Аб'ём валавой прадукцыі прамысл. павялічыўся да 1970 у параўнанні з 1940 у 6,4 раза. Галоўныя галіны прамысл.: вугальная, металург., маш.-буд. і хімічная. Развіта прамысловасць буд. м., харч., лёгкая і інш. У вобласці 148 высокамеханізаваных шахтаў. У 1969 здабыта 73,6 млн. *т* кам. вугалю. Чорная металургія базіруецца на мясцовым вугалі і крыварожскай жал. рудзе. Найбольшыя прадпрыемствы: металург. з-д у Камунарску, з-д ферасплаваў у Кадзіеўцы. Развіта машынабудаванне транспартнае і вугальнае, станкабудаванне (з-ды: цеплавозабуд. імя Кастр. рэвалюцыі, вугальнага машынабуд., шчолачных акумулятараў, электраапаратаў у Варашылаўградзе, машынабуд. ў Красным Лучы і Кадзіеўцы, эл.-мех. ў Первамайску, аўтазапчастак у Краснадоне, пракатных валкоў у Лутугіне). Хім. і коксахім. прамысл. Хім. камбінаты ў Северадонецку (вытв. аміяку, капралактаму, мінер. угнаенняў) і Рубежным (вытв. аніліпавых фарбаў, к-т і інш.). Содавы з-д у Лісічанску, сажавы ў Кадзіеўцы. Коксахім. з-ды ў Камунарску, Кадзіеўцы і Успенцы. Прамысл. буд. м (57,8% акоппага шкла ў УССР), дрэваапр., лёгкая (тонкасуконны камбінат і абутковая ф-ка ў Варашылаўградзе, панчошна-шкарпэткавая ф-ка ў Рубежным). Харч. (мукамольна-крупяная, маслабойная, малочная, мясная, садавіна-агародніпная, кандытарская, піваварная і інш.) прамысл. Цэнтры лёгкай і харч. прамысл.: Варашылаўград, Северадонецк, Кадзіеўка, Камунарск, Лісічанск. Варашылаўградская (у г. Шчасце), Северадонецкая і Шчэраўская ЦЭС. У В. в. (1969) 187 калгасаў і 125 саўгасаў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1969) 1454,3, у т. л. пад збожжавымі і вернебабовымі 692,1, тэхн. 156,2, агародніна-бахчавымі 30,6, кармавымі 537,5. Асн. збожжавыя культуры пшаніца (125,8 тыс. *га*), кукуруза (228,9 тыс. *га*), ячмень (169,1 тыс. *га*). З тэхн.— сланечнік (155,2 тыс. *га*). Садоўніцтва і вінаградарства. Жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. На пач. 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 746,6 (у т. л. кароў 302,3), свіней 560,2, авечак і коз 218,8. Даўж. чыгунак 1178 *км* (1969). Чыг. вузлы: Папасная, Родакава, Варашылаўград і інш. Аўтанал, Родакава, Варашылаўград і інш. Аўтамаб. дарог з цвёрдым пакрыццём 2,6 тыс. *км*. У Варашылаўградзе аэрапорт. Ін-ты: горнаметалургічны, маш.-буд., с.-г., мед., пед. 36 сярэдніх спец. навуч. устаноў, 2 тэатры, філармонія, 3 музеі. Абл. газеты: «Прапор перамогі» і «Ворошиловградская правда».

Літ.: Советский Союз. Украина. Районы, М., 1969. *А. М. Семяненка.* Варашылаўград.

ВАРАШЭНЬ Аляксей Дзям'янавіч (н. 14.11. 1920, в. Воўкавічы Сенненскага пав. Віцебскай губ.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху

на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1945. Скончыў с.-г. тэхнікум (1939), ваен. вучылішча (1941). У 1942 на *асобым беларускім зборы*. З 24.6.1942 камандзір партыз. атрада «Перамога» ў Талачынскім р-не, з 4.3.1944 камандзір *партызанскай брыгады «Грава»*. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Талачыне.

ВАРВАРАЎКА, вёска ў Бяседавіцкім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Праца». За 7 *км* на ПдЗ ад Хоцімска, 207 *км* ад Магілёва, 45 *км* ад чыг. ст. Камунары. 207 ж., гасп. 72 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адз. сувязі, магазін. Помнік воінам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ВАРВАРСКІЯ ПРАЎДЫ (лац. leges barbarorum законы іншаземцаў), запісы звычаёвага права германскіх плямёнаў 5—9 ст.

Узніклі пасля стварэння на тэр. былой Рымскай імперыі варварскіх феад. дзяржаў. У В. п. звычаёвае права дастасавана да патрэб свецкіх і царк. магнатаў раннефеад. перыяду. Да В. п. належаць: Вестготская, Бургундская, Салічаская, Рыпуарская, Алеманская, Баварская, Саксонская праўды і інш. В. п. маюць шэраг агульных рысаў в запісамі звычаёвага права негерманскіх плямёнаў (напр., са старажытнаскандынаўскімі законамі, *«Рускай праўдай»* і інш.). З развіццём феад. права і канчатковым усталяваннем феад. адносін В. п. перасталі ўжывацца.

ВАРВАРСТВА (ад *варвары*), у культурнагістарычнай перыядызацыі Л. Г. *Моргана* другі перыяд гісторыі чалавецтва (паміж дзікасцю і цывілізацыяй), які пачаўся з ганчарнай вытворчасці і скончыўся вынаходствам пісьма. Тэрмінам В. карыстаўся Ф. Энгельс. Іншая перыядызацыя гісторыі грамадства ніжэйшай ступенню В. лічыць пачатак жывёлагадоўлі і земляробства; найвышэйшай — распад першабытнаабшчыннага ладу і станаўленне класавага грамадства. Паводле археал. перыядызацыі В. адпавядаюць неаліт, бронзавы век і перыяд ранняга жалеза. У звычайным словаўжыванні В.— надзвычайная жорсткасць, грубасць, некультурнасць.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы. Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; Толстов С. П. К вопросу о периодизации истории первобытного общества, «Советская этнография», 1946, № 1; Морган Л. Г. Древнее общество..., пер. с англ., 2 изд., Л., 1935.

ВАРВАРЫ (грэч. barbaroi іншаземцы), слова, якім старажытныя грэкі, потым рымляне называлі ўсіх іншаземцаў, што гаварылі на незразумелай ім мове. У перыяд заняпаду Рым. імперыі В. называлі плямёны бургундаў, *вестготаў*, *остготаў*, *вандалаў* і інш., якія заваёўвалі яе тэр. і ўтваралі т. зв. «варварскія каралеўствы». «Варварскія заваяванні» суправаджаліся знішчэннем помнікаў антычнай культуры, што дало падставу паэтам называць В. разбуральнікаў, грубых, адсталых, жорсткіх людзей.

ВАРВАШЭНЯ Іван Дзянісавіч [18(31).12.1904, в. Быстрыца Слуцкага пав. Мінскай губ.— 4.3.1957], парт. і дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Да 1925 на с. гасп. У 1925—28 на камсамольскай рабоце. Скончыў Мінскі палітэхнікум, Маскоўскі ін-т ін-



жынераў чыг. транспарту (1934); працаваў на Зах. чыгунцы. З 1939 заг. транспартнага аддзела, з сак. 1941 сакратар па транспарце Мінскага абкома КП(б)Б. У Айч. вайну другі сакратар Мінскага абкома КП(б)Б і адначасова сакратар Слуцкага падпольнага міжрайкома, чл. *Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б*, камісар партыз. злучэння Слуцкай зоны. З ліп. 1943 у апараце ЦК КП(б)Б, з 1944 сакратар Мінскага абкома КП(б)Б, з 1950 першы сакратар Мінскага гаркома КПБ. На XIX з'ездзе КП(б)Б выбраны канд., на XX і XXI з'ездах чл. ЦК КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР 2—4-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

Г. П. Купрэева. Мінск.

ВАРГА Яўген Самойлавіч (6.11.1879, Венгрыя — 7.10.1964), савецкі эканаміст. Акад. АН СССР (1939) і АН УССР (1939). Чл. КПСС з 1920. У 1919 адзін з дзеячаў Венгерскай Сав. Рэспублікі. У 1920 пераехаў у Маскву, удзельнічаў у рабоце II кангрэсу Камінтэрна. У 1927—47 узначальваў Ін-т сусв. гаспадаркі і сусв. палітыкі АН СССР; быў гал. рэдактарам час. «Мировое хозяйство и мировая политика». Ленінская прэмія 1963.



Тв.: Основные вопросы экономики и политики империализма (после второй мировой войны), 2 изд., М., 1957; Капитализм двадцатого века, М., 1961; Современный капитализм и экономические кризисы, 2 изд., М., 1963; Очерки по проблемам политэкономии капитализма, М., 1965.

Літ.: Арзуманян А. А. К 80-летию академика Е. С. Варга, у кн.: Проблемы современного капитализма, М., 1959.

ВАРЫЕТЭ (франц. variété, ад лац. varietas разнастайнасць), від тэатра, які спалучае жанры тэатр., муз., эстраднага і цыркавога мастацтваў. Паказам В. ўласцівыя камедыйныя элементы, іронія, пародыя, эротыка.

Як тып відовішчаў В. пашыраны ў вялікіх капіталіст. гарадах. Узніклі ў 18 ст. ў Францыі, дасягнулі росквіту ў 20—30-я г. 20 ст. На Захадзе тэрмін В. ўжываюць і ў сэнсе эстрада, аб'ядноўваюць паказы кабарэ і т-раў бурлеск. В. уключае і жанр рэвю.

ВАРЛАМАЎ Аляксандр Ягоравіч [15(27).11.1801, Масква — 15(27).10.1848], рускі кампазітар, спявак і вакальны педагог. Выкладаў спевы ў Пецярбургу і Маскве, у 1832—44 капельмайстар і кампазітар маск. т-раў. Адыграў выдатную ролю ў развіцці рус. вак. музыкі. Напісаў больш за 150 рамансаў і песень (самыя папулярныя — «Чырвоны сарафан», «На світанні яе не будзі», «Бялее ветразь адзі-

нокі», «Па-над вуліцай мяцеліца мяце»), аўтар балетнай і тэатр. музыкі, дапаможніка «Поўная школа спеваў» (1840).

Літ.: Листова Н. А. Александр Варламов, М., 1968 (бібліягр.).

ВАРЛАМАЎ Канстанцін Аляксандравіч [11(23).5.1849, Пецярбург — 2(15).8.1915], рускі акцёр. Сын кампазітара А. Я. *Варламава*. Творчую дзейнасць пачаў у 1867 у правінцыі. З 1875 у Пецярбургскім Александрынскім т-ры. Камедыйны акцёр-імправізатар, спалучаў традыцыі буфанады з глыбокай псіхал. распрацоўкай вобразаў. Меў багаты па дыяпазоне голас. Сыграў каля 1000 роляў, большасць у вадэвілях. З класічнага рэпертуару: Варавін, Мурамскі («Справа», «Вяселле Крачынскага» А. Сухава-Кабыліна), Восіп, Яічніца («Рэвізор», «Жаніцьба» М. Гогаля), Сганарэль («Дон Жуан» Мальера). У п'есах А. Астроўскага пераважна выконваў ролі купцоў-самадураў: Бальшова, Кураслепава («Свае людзі — паладзім», «Гарачае сэрца»). В. наз. «царом рус. смеху».



Літ.: Кара С. Варламов, Л., 1969.

ВАРНАЛІС (Bárnalēs) Костас [н. 14(26).2.1884, г. Бургас у Балгарыі], грэчаскі пісьменнік і грамадскі дзеяч, заснавальнік сацыяліст. п-ры ў Грэцыі. Скончыў філас. ф-т Афінскага ун-та (1908). Нядоўга быў рэпрэсіраваны. Першы зб. вершаў «Соты» (1905). Пад уплывам Кастр. рэв. і паражэння Грэцыі ў вайне з Турцыяй 1919—22 лірычныя матывы ў творчасці В. саступаюць месца вострай паліт. сатыры на бурж. лад. Сацыяльна-рэвалюц. ідэямі прасякнуты зб. вершаў «Святло, якое пячэ» (1922), аповесці-памфлеты «Сапраўдная апалогія Сакрата» (1931), «Дзённік Пенелопы» (1947), «Дыктатары» (1956). Кн. «Саламос без метафізікі» (1925) дала пачатак матэрыялісц. эстэтыцы ў Грэцыі. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1958.


Тв.: Рус. пер. — Избранное, М., 1959; Эстетика. — Критика, М., 1961.

Літ.: Мочос Я. Костас Варналис и литература греческого Сопротивления, М., 1968.

ВАРНКЕ (Warnke) Герберт (н. 24.2.1902), дзеяч германскага і міжнар. рабочага руху, грамадскі дзеяч ГДР. З 1920 чл. герм. прафсаюза металістаў, з 1923 камуніст. У 1932 выбраны дэпутатам рэйхстага. Пасля прыходу да ўлады гітлераўцаў (1933) перайшоў на нелегальнае становішча, потым эмігрыраваў у Данію, Швецыю. З 1939 да 1943 у турме, у лагеры для інтэрніраваных. З 1948 старшыня Цэнтр. праўлення Аб'яднання свабодных прафсаюзаў. З 1950 дэп. Нар. палаты ГДР. З 1958 чл. Палітбюро ЦК Сацыяліст. адзінай партыі Германіі. Чл. бюро Сусв. федэрацыі прафсаюзаў. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1966.



ВАРНЯНЫ, вёска ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Чапаева. За 11 *км* на Пн ад Астраўца, 266 *км* ад Гродна, 19 *км* ад чыг. ст. Гудагай, на шашы, якая звязвае В. з Астраўцом. 1284 ж., двароў 341 (1970). Раённае і Варнянскае аддзяленні Сельгастэхнікі, атэлье камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, клуб, б-ка, амбулаторыя, дзіцячы сад, адз. сувязі, 2 сталовыя, 7 магазінаў.



Варняны. Жылая забудова 18 ст. Від з паўд. ваходу. Генеральны план цэнтра 17—18 ст.: *1* — палац; *2* — флігелі; *3* — вежа-альтанка на востраве; *4* — касцёл; *5* — карчма і крамы; *6* — жылыя дамы.

Рэгулярная планіроўка і забудова цэнтра В. зберагліся з 2-й пал. 18 ст. Цэнтр. плошча (у плане выцягнуты прамавугольнік) з тарцоў замыкалася двухвежавым касцёлам св. Георгія (заложаны ў 1462, закончаны каля 1769, дабудоўкі 1880, 1903) і двухпавярховым палацам з двума сіметрычна пастаўленымі флігелямі (не збярогся). Падоўжныя бакі плошчы забудаваны аднатыповымі будынкамі, якія злучаны аркамі. Каля касцёла — двухпавярховыя дамы (1770). У парку на востраве — вежа-альтанка (канец 19 ст.). Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАРОН (Varro) Марк Тэрэнцый (116—27 да н. э.), рымскі пісьменнік і вучоны. Арганізаваў першую ў Рыме публічную б-ку. Аўтар гістар., філас., літ. прац («Старажытнасці», 41 кн.; «Пра лацінскую мову», 25 кн.; «Навукі»; «Меніпавы сатыры», 150 кн.; «Пра сельскую гаспадарку», 3 кн.).

ВАРОНА (Corvus corone), птушка сям. крумкачовых атр. вераб'іных. Даўж. цела 45—50 *см*, маса 430—560 *г*. Вельмі пашыраная ў Еўропе і Азіі. На Беларусі два падвіды: звычайная шэрая В.— *C. c. cornix* (апярэнне на спіне і брушку шэрае, галава, гарляк, валлё, крылы і хвост чорныя) і звычайная чорная В.— *C. c. corone* (усё апярэнне чорнае). Першая — звычайная птушка, другая вядомая як залётная з Зах. Еўропы. В. часткова аселыя. Многія пералятаюць на вялікія адлегласці. Гнёзды робяць на дрэвах у невялікіх лясах

непадалёку ад паселішчаў, у парках, садах і інш. Нясуць 4—5 яец. Уследныя.

Літ.: Гл. пры арт. *Птушкі.*

ВАРОНА, вёска ў Варнянскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Карла Маркса. За 21 *км* на Пн ад Астраўца, 271 *км* ад Гродна, 25 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 229 ж., двароў 70 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 2 помнікі: 17 аднавяскоўцам і 52 сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАРОНЕЖ, горад, цэнтр Варонежскай вобл., на р. Варонеж. Чыг. вузел, аэрапорт. 660 тыс. ж. (1970).

В. заснаваны ў 1586 як крэпасць для абароны ад набегаў крымскіх і нагайскіх татар. Пётр I пабудаваў у В. флот для *азоўскіх паходаў 1695—96.* З 1711 цэнтр Азоўскай, з 1725 Варонежскай губ., з 1779 Варонежскага намесніцтва, з 1824 Варонежскай губ. У 1895 у В. ўзнікла с.-д. група. Сав. ўлада ўстаноўлена 30.10(12.11).1917. З 1928 цэнтр Цэнтральначарназёмнай, з 1934 Варонежскай вобл. У Айч. вайну з ліп. 1942 да 25.1.1943 у В. ішлі цяжкія баі.

Маш.-буд. (экскаватары, с.-г. машыны, кавальска-прэсавае абсталяванне і тэхнал. абсталяванне для горнарудналай, хім., тэкст., харч. прамысловасці), хімічная (з-ды сінт. каўчуку, шыны, аўтагенны, фармацэўтычны), электратэхнічная (тэлевізары, радыёпрыёмнікі, электратэхн. абсталяванне), буд. м. (зборны жалезабетон), харч. прамысловасць. 2 ЦЭЦ. 10 ВНУ, у т. л. ун-т (з 1918), 12 сярэдніх спец. навуч. устаноў, 4 тэатры, 3 музеі.

ВАРОНЕЖСКА-КАСТОРНЕНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1919, наступальная аперацыя 12 кастр.—5 ліст. коннага корпуса С. М. Будзённага ва ўзаемадзеянні з часцямі 13, 8 і 9-й армій па разгроме белагвардзейскіх кавалерыйскіх карпусоў Мамантава і Шкуро ў раёне г. Варонежа і ст. Касторнае. Састаўная частка контрнаступлення Паўд. фронту супраць войск Дзянікіна.

У ходзе наступлення конны корпус Будзённага 24 кастр. авалодаў Варонежам. У баях 5—15 ліст. сав. войскі нанеслі паражэнне белагварда. войскам у раёне Касторнае, Сукоўкіна, захапілі 3 тыс. палонных, 4 бронецягнікі, 4 танкі, 22 гарматы і 100 кулямётаў. У выніку аперацыі Данская 1 Добравольніцкая арміі белых былі рассечаны і адкінуты ў розныя напрамкі: на іх стыку створана гал. ўдарная група сав. франтоў супраць Дзянікіна. В.-К. а. разам з *Арлоўска-Кромскай аперацыяй 1919* мела важнае значэнне для перамогі сав. войск на Паўд. фронце ў 1919.

ВАРОНЕЖСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 13.6.1934. Пл. 52,4 тыс. *км*². Нас. 2527 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 27 раёнаў; 14 гарадоў, 21 гар. нас. Цэнтр вобласці — г. Варонеж.

В. в. знаходзіцца ў бас. верхняга і сярэдняга цячэння Дона. Зах. частка на Сярэднерускім узвышшы (выш. да 241 *м*, Данское Белагор'е), усх.— на Окска-Данской раўніне. На ПдУ Калацкае ўзвышша (выш. да 234 *м*). Данское Белагор'е і Калацкае ўзвышша моцна парэзаныя ярамі і лагчынамі. Карысныя выкапні: цэментныя мергелі, мел, вогнетрывалыя, керамічныя і фарбавальныя гліны, граніт, медна-нікелевыя руды, кварцавы пясок. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад −11 на Пн да −8,5 °С на Пд, ліп. 19—22 °С. Ападкаў 550 *мм* на ПнЗ і 455 на ПдУ за год. Вегет. перыяд 190 дзён на Пн і 200 на Пд. Рэкі: Дон з прытокамі Патудань, Ціхая Сасна, Чорная Каліткa, Багучар, Варонеж, Віцюг, Асярэдзь, Хапёр (з прытокам Варона). Глебы пераважна чарназёмныя, на Пн магутныя і вышчалачаныя, на Пд звычайныя і паўднёвыя; у поймах рэк алювіяльна-лугавыя. Пад лесам 10,3% тэр. Варонежскі і непадалёку ад Новахапёрска Хапёрскі запаведнікі. Асн. насельніцтва рускае, на Пд жывуць украінцы. Сярэдняя шчыльн. 48,2 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 46% (1970). Найб. гарады: Варонеж (660 тыс. ж., 1970), Барысаглебск (165 тыс. ж.), Георгіу-Дэж, Росаш, Астрагожск, Паворына.


Асн. галіны прамысл.: маш.-буд., эл.-тэхн., хім., харч., буд. матэрыялаў, лёгкая. Маш.-буд. выпускае тэхнал. абсталяванне для горнарудналай, хім., тэкст., харч. і інш. галіп прамысл. Маш.-буд., радыётэхнічная і лёгкая прамысл. у Варонежы і Барысаглебску, эл.-тэхн. і хім.— у Варонежы. З-д вогнетрывалых вырабаў (Сямілукі), тэхнал. мелу (Капаніпча), мінер. фарбаў (Жураўка), зборных жалезабетонных канструкцый (Варонеж). У Астрагожску гарбарны з-д. Энергетычная база прамысл.— Новаваронежская атамная эл. станцыя, 2 варонежскія ЦЭЦ, якія працуюць на данецкім вугалі і прыродным газе Паўн. Каўказа і Шабляпінкі. Цукровыя, малочна-масларобчыя, сыраварныя, мукамольна-крупяныя, мясныя, садова-агародніпныя прадпры-


ВАРОНЕЖСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Маштаб 1:4 000 000
40 0 40 80 км
1. Курская вобласць
ВАРОНЕЖ
Астрагожск
Сярэдняя Расія
Данское Белагор'е
Данская нізіна
Данбасс
Белгародская вобл.
Курская вобл.
Растоўская вобл.
Волгаградская вобл.
Сярэдне-Расійская возв.
Сярэдне-Расійская вобл.
Данская вобл.
Данбасская вобл.
Данбасская возв.
Данбасская нізіна
Данбасская вобл.
Данбасская возв.
Данбасская нізіна
Данбасская вобл.
Данбасская возв.
Данбасская нізіна

Тв.: Древнее Гродно, М., 1954 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 41); Бельчицкие рунны, «Архитектурное наследство», 1956, т. 6; Зодчество Северо-Восточной Руси XII—XV вв., т. 1—2, М., 1962; Владимир. Боголюбово. Суздаль. Юрьев-Польской, 3 изд., М., 1967.

Літ.: Вагнер Г. К. Николай Николаевич Воронин, у кн.: Культура Древней Руси, М., 1966; его ж. К 60-летию Николая Николаевича Воронина, «Советская археология», 1964, № 4.

ВАРОНІНА, бескурганны могільнік *зарубінецкай культуры* (3 ст. да н. э.—1 ст. н. э.) у в. Вароніна Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Раскопаў Ю. У. Кухарэнка ў 1952—54. Выяўлены 52 пахаванні з трупаспаленнем у круглых і прадаўгаватых ямах. Разам з кальцыніраванымі касцямі, вуголлем і попелам



Бранзалет і фібулы з могільніка Вароніна.

знойдзены 43 ляпныя гаршкі, 39 місак, 3 кубкі з ручкамі, 3 гліняныя пасудзіны, 2 падкавападобныя і 18 сярэднелатэнскіх фібулаў, 13 бронзавых шпілек, 4 бранзалеты, шкляная імпартная грэчаская пацерка, гліняныя прасліцы, кавалак расплаўленага шкла і інш. Рэчы зберагаюцца ў Гістар. музеі ў Маскве, Гомельскім абл. і Тураўскім краязнаўчым музеях. За 1—2 *км* на Пд ад могільніка ў 1961 адкрыты 4 вялікія паселішчы розных перыядаў жалезнага веку.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Зарубинецкая культура, М., 1964; Поболь Л. Д. Древности Туровщины, Мн., 1969. *Л. Д. Побаль.* Мінск.

ВАРОНІЧЫ, возера ў бас. р. Ушачы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,18 *км*². Даўж. 4,5 *км*, найб. шыр. 0,35 *км*, сярэдняя 0,26 *км*. Катлавіна выцягнута амаль у мерыдыянальным кірунку. Вадазбор узгорыста-марэнны. Праз воз. працякае Ушача. Водзяцца лешч, шчупак, гусцяра, плотка, акунь і інш.

ВАРОНІЧЫ, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., на р. Ушача. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Варонічы». За 22 *км* на ПдЗ ад Полацка, 120 *км* ад Віцебска, 16 *км* ад чыг. ст. Ветрына, на шашы Полацк — Ушачы — Лепель. 511 ж., двароў 163 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 3 магазіны. Брацкая магіла партызанаў Вял. Айч. вайны.

Каля В., на левым беразе Ушачы, гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры* (3—4 ст.), умацаванае равамі і валамі. Даследавалася А. Р. Мітрафанавым у 1949. Пры раскопках выяўлена ляпная кераміка 10—11 ст., касцяныя праколкі, жалезныя шлакі і інш. Насельніцтва займалася лядным земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам, апрацоўкай жалеза, косці і дрэва, ткацтвам і інш. За 5 *км* на Пд ад В., на правым беразе Ушачы, ва ўрочышчы Мяніца паселішча 6—8 ст., якое даследавалася Мітрафанавым у 1965. Пры раскопках знойдзена ляпная кераміка 6—8 ст. і порыляду Кіеўскай Русі.

Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины, у кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики, М., 1959 (Труды Прибалтийской объед. комплексной экспедиции, [т.] 1); Митрофанов А. Г. Новые данные о памятниках VI—VIII вв. средней и северной Белоруссии, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1966.

А. Ц. Навумовіч. Полацкі раён; *А. Р. Мітрафанаў.* Мінск.

ВАРОНЧА, вёска ў Карэліцкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Варонча». За 22 *км* на Пд ад Карэліч, 200 *км* ад Гродна, 45 *км* ад чыг. ст. Баранавічы. 282 ж., двароў 81 (1970). Спіртзавод, камбінат быт. абслугоўвання, майстэрня. Сярэдняя школа, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле 60 сав. воінаў, 2 партызанаў і 60 жыхароў вёскі, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАРОНЫ, вёска ў Віцебскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Вароны». За 16 *км* на У ад Віцебска, на шашы Віцебск — Лёзна. 529 ж., двароў 194 (1970). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад-яслі, сталовая, 2 магазіны. Каля В. у 1912 пастаўлены помнік у гонар перамогі рус. войск над французскімі ў кастр. 1812. У Айч. вайну вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. На Кургане Славы мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў Айч. вайну. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 26 сав. воінаў, якія пад каманд. лейтэнанта І. Е. Бясхлебнага ў снеж. 1943 паўтарылі подзвіг 28 панфілаўцаў. На брацкай магіле помнік 3750 сав. воінам.

ВАРОЎСКІ Вацлаў Вацлававіч [псеўд. П. Арлоўскі, Шварц, Фаўн, Жазэфіна і інш.; 15(27).10.1871, Масква — 10.5.1923], савецкі дзярж. і парт. дзеяч, дыпламат, публіцыст і літ. крытык. З сям'і інжынера. Чл. КПСС з 1894. Скончыў Маск. вышэйшае тэхн. вуч. (1897). У 1894—97 чл. Маскоўскага «Рабочага саюза». За ўдзел у рэвалюц. руху ў 1897 арыштаваны, у 1899 высланы ў Вяцкую губ. У 1902 эмігрыраваў за мяжу. Супрацоўнічаў у газ. *«Искра»*. Адзін з арганізатараў (1904) Паўд. бюро ЦК РСДРП. У 1905 з У. І. Леніным выдаваў газ. «Вперед», «Пролетарий», «Новая жизнь». У публіцыст. і літ.-крытычных артыкулах («Лішнія людзі», 1905; «Узнікненне рабочага класа», 1906; «Да гісторыі марксізма ў Расіі», 1908; «Базараў і Санін. Два нігілізмы», 1909; «Леанід Андрэеў», «Максім Горкі», 1910, і інш.) прадаўжаў традыцыі рус. рэвалюц. дэмакратаў, адстойваў партыйнасць, народнасць і рэалізм у л-ры. У сак. 1917 увайшоў у Замежнае бюро ЦК РСДРП(б) у Стакгольме. Пасля Кастр. рэв. на дыпламат. рабоце: у 1917—19 паўнамоцны прадстаўнік РСФСР у скандынаўскіх краінах, у 1921—23 у Італіі; удзельнік Генуэзскай (1922), Лазанскай (1922—23) міжнар. канферэнцый. Дэлегат III і IV з'ездаў РСДРП. Забіты ў Лазане белагвардзейцамі. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве. Імем В. названы вуліцы многіх гарадоў СССР.



Тв.: Соч., т. 1—3, М., 1931—33; Литературно-критические статьи, М., 1956; Статьи и материалы по вопросам внешней политики, М., 1959.

Літ.: Луначарский А. В. Вацлав Вацлавович Воровский как литературный критик, Собр. соч., т. 8, М., 1967; Пиляшев Н., Воровский, М., 1959.

ВАРСІНКІ, мікраскапічныя выраслі слізістай абалонкі тонкіх кішак у чалавека, млекакормячых жывёл, птушак і некаторых рыб. Павялічваюць паверхню, якою ўсмоктваюцца пажыўныя рэчывы.

ВАРСКІ (Warski; сапр. Варшаўскі-Варскі) Адольф Ежы (20.4.1868—21.8.1937), дзеяч польскага рабочага руху, публіцыст. З сям'і служачага. Удзельнічаў у арганізацыі Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага (1893), потым Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), быў чл. яе Гал. праўлення. З Ю. *Мархлеўскім* пачаў выдаваць у Парыжы газету «Sprawa Robotnicza» («Рабочая справа»), цэнтр. орган партыі. Удзельнік рэвалюц. падзей у Польшчы 1905—07. Пасля аб'яднання СДКПіЛ з РСДРП (1906) увайшоў у склад ЦК РСДРП. Адзін са стваральнікаў Камуніст. рабочай партыі Польшчы (1918; з 1925 — Кампартыя Польшчы (КПП)]. У 1919—29 чл. ЦК, з 1923 чл. Палітбюро ЦК КПП, з 1928 дэпутат сейма ад кампартыі. Удзельнік 3—6-га канграсаў Камінтэрна, І з'езду Кампартыі Зах. Беларусі (ліпень 1928). У 1929 эмігрыраваў у СССР.



Тв.: Wybór pism i przemówień, t. 1—2, Warszawa, 1958.

ВАРТАСЦЬ, увасобленая ў тавары і арэчаўленая ў ім грамадская праца таваравытворцаў. Ствараецца *абстрактнай працай* таваравытворцаў, г. зн. затратамі іх рабочай сілы (мускульнай, мазгавой, нервовай энергіі). Таму ўсе тавары, адрозніваючыся як спажывецкія вартасці (пшаніца, тэлевізар, аўтамабіль), аднародныя як В. (гл. *Тавар*). У В. выражаюцца вытворчыя адносіны таваравытворцаў, якія пры абмене рэчаў фактычна параўноўваюць затраты сваёй працы. В. вызначаецца не індывідуальнымі, а грамадска неабходнымі затратамі працы, якія вымяраюцца часам, патрэбным для вырабу рэчы пры грамадска нармальных умовах вытворчасці (сярэднія ўзровень тэхнікі і ўмовы працы), а таксама сярэдняй умеласцю і інтэнсіўнасцю працы. Велічыня В. знаходзіцца ў адваротнай залежнасці ад прадукцыйнасці працы: чым вышэйшая апошняя, тым ніжэйшая В. Пры росце *інтэнсіўнасці працы* (у адносінах да грамадска нармальнага ўзроўню) павялічваецца напружанасць працы ці затраты энергіі за адзінку часу, а ў выніку павышаецца і В. тавару. На велічыню В. непасрэдна ўплываюць складанасць працы, кваліфікацыя работніка. За аднолькавы час складаная праца стварае большую В., чым простая. Выражаючы пэўную сістэму вытворчых адносін, В. паказвае асаблівасці той ці іншай таварнай гаспадаркі. У адрозненне ад простай і капіталіст. вытворчасці, дзе В. адлюстроўвае анархію гаспадаркі і дзе параўнанне велічынь В. адбываецца стыхійна, пры сацыялізме В.— выражэнне планамернасці. В. пры сацыялізме адрозніваецца ад В. пры капіталізме і структураю. Пры капіталізме В. распадаецца на пастаянны і пераменны капітал (гл. *Капітал*) і *прыбавачную вартасць*, якая прысвойваецца буржуазіяй, што паказвае эксплуататарскую сутнасць працэсу стварэння В. Пры сацыялізме В. падзяляецца на В. выкарыстаных сродкаў вытворчасці, В., створаную неабходнай працай, і В., створаную прыбавачнай працай. Гэтае дзяленне неантаганістычнае, бо ўсе 3 часткі В., у т. л. і В., створаная прыбавачнай працай, належаць працоўным. В. выражае сутнасць таварнай вытворчасці, яе ўнутраныя, прычынныя сувязі, таму выступае як эканам. закон. Змест закону вартасці заключаецца ў тым, што вытворчасць і абмен тавараў ажыццяўляюцца на аснове грамадска неабходных затрат працы.

У таварнай гасп., заснаванай на прыватнай уласнасці, закон В. з'яўляецца стыхійным рэгулятарам вытворчасці. На аснове гэтага закону ў простай і капіталіст. гаспадарцы адбываецца стыхійны прыток рабочай сілы і сродкаў вытворчасці ў тыя галіны, дзе цэны на тавары з-за павышанага попыту падымаюцца вышэй В. Закон В. стымулюе развіццё прадукцыйных сіл, бо канкурэнтную барацьбу вытрымліваюць тыя таваравытворцы, якія з дапамогай новай тэхнікі і перадавой тэхналогіі зніжаюць індывідуальную В. тавараў у параўнанні з грамадска неабходнымі затратамі. У выніку дробныя таваравытворцы бяднеюць, папаўняюць армію наёмных рабочых, а буйныя багацеюць, становяцца капіталістамі. Закон В., такім чынам, узмацняе эканам. няроўнасць і канкурэнтную барацьбу, спрыяе ператварэнню простай таварнай гаспадаркі ў капіталістычную. На стадыі даманапалістычнага капіталізму, калі капітал мог свабодна перамяшчацца з адной галіны ў другую, В. выяўлялася ў форме *цэны вытворчасці*. На стадыі імперыялізму ў сувязі з панаваннем манаполій закон В. перажывае далейшыя змены: манапольныя цэны ў маштабе суск. капіталіст. гаспадаркі.

У сацыяліст. гр-ве захоўваецца таварная вытворчасць, і таму як у сферы вытворчасці, так і ў сферы абарачальнасці дзейнічае закон В. Але ў выніку асаблівасцей сацыяліст. вытворчых адносін і таварнай вытворчасці пры сацыялізме дзеянне закону В. набывае планамерны характар і свядома выкарыстоўваецца грамадствам. Паводле закону В. ўсе індывідуальныя затраты працы зводзяцца да грамадска неабходных затрат, што стымулюе

навукова-тэхн. прагрэс, спецыялізацыю і канцэнтрацыю вытворчасці; садзейнічае выпуску прадукцыі ў адпаведнасці з попытам грамадства, бо праца, затрачаная на выраб не патрэбных грамадству тавараў, марная. На выкарыстанні закону В. грунтуецца *гаспадарчы разлік*. Кожнае гасп.-разліковае прадпрыемства імкнецца пакрыць свае затраты выручкай ад рэалізаваных тавараў і атрымаць прыбытак. Пры гэтым цэны, па якіх рэалізоўваецца прадукцыя, вызначаюцца дзяржавай на аснове грамадска неабходных затрат працы. Зменшваючы свае затраты, прадпрыемства павялічвае прыбытак, частка якога ідзе на матэрыяльнае заахвочванне работнікаў і развіццё новай тэхнікі, што стымулюе далейшае развіццё вытворчасці. Закон В. выкарыстоўваецца таксама пры вызначэнні эфектыўнасці новай тэхнікі і капіталаўкладанняў. На яго аснове вызначаюцца цэны. Планамерна павышаючы ці зніжаючы іх адносна ўзроўню В., дзяржава пераразмяркоўвае нац. даход, стымулюе выпуск адных тавараў (напр., дэфіцытных і высокай якасці) і абмяжкоўвае спажыванне другіх (напр., віна-гарэлачных і тытунёвых вырабаў).

Закон В. мае цесную ўзаемасувязь і ўзаемадзеянне з усёй сістэмай эканам. законаў сацыялізма. Калі асн. закон сацыялізма вызначае кірунак развіцця грамадскай вытворчасці, дае яму якасную характарыстыку, то закон В. характарызуе яго колькасна: дабрабыт народа залежыць ад скарачэння затрат працы на выраб прадукцыі. З законам планамернага развіцця яго сувязь у тым, што ўлік затрат *грамадска неабходнай працы* з'яўляецца важным сродкам вызначэння аптымальных прапорцый у нар. гасп. Закон В. цесна звязаны таксама з законам пяўхільнага росту прадукцыйнасці працы: ад узроўню апошняй залежыць велічыня В. Паколькі аб'ём і якасць працы ўлічваюцца ў вартаснай (грашовай) форме, то закон В. мае непасрэдную сувязь з законам размеркавання па колькасці і якасці працы. Як і ўсе эканам. законы, закон В. мае аб'ектыўны характар і разам з вартаснымі катэгорыямі (*цана, прыбытак, кошт, прыбытак, кошт, прыбытак, кошт

А. І. Ягораў, чл. РВС І. В. Сталін, Р. І. Берзін) з Украіны. У сувязі з выдзяленнем часткі Паўд.-Зах. фронту ў самастойны Паўд. фронт для барацьбы з Урангелем 5 жн. ЦК РКП(б) зацвердзіў прапанову РВС Рэспублікі пра перадачу з Паўд.-Зах. фронту 1-й Коннай, 12, 14-й армій Заходняму фронту для ажыццяўлення В. а. сіламі аднаго Заходняга фронту. Аднак перададзена была толькі 58-я дывізія 12-й арміі. 4, 15 і 3-я арміі (37—38 тыс. чал.) павінны былі фарсіраваць Віслу і абысці Варшаву з Пн і З; 16-я армія (каля 11 тыс. чал.) — фарсіраваць Віслу на Пн ад Варшавы; мазырская група (разам з 58-й дывізіяй — 6,5 тыс. чал.) наступала на ўчастку Казеніцы, Івангарад. Аднак польскае камандаванне рыхтавала генеральную бітву на У ад Вісты. 1-я польская армія (каля 30 тыс. чал., ген. Л. Жалігоўскі) адводзілася з Беларусі для абароны Варшавы, 4-я (ген С. Шаптыцкі) — з раёна Брэст-Літоўска за р. Вепш, дзе разам з 3-й польскай арміяй (ген. Э. Рыдз-Сміглы) склала манеўровую групу армій (25—30 тыс. чал.) для нападу на фланг і тыл сав. войск. Выкарыстаўшы ўздым шавінізму ў краіне і ваен. дапамогу дзяржаў Антанты, польскае камандаванне сфарміравала 2 новыя арміі: 5-ю (28—30 тыс. чал.) і 2-ю (10—12 тыс. чал.). У ходзе баёў 14—16 жн. сав. войскі, якія спачатку авалодалі часткай Варшаўскіх умацаванняў, вымушаны былі адступіць. У раёне мазырскай групы польскія войскі прайшлі на 60—80 км, пагражаючы тылам Зах. фронту. 18 жн. пачалося агульнае наступленне польскіх войск. Да 25 жн. галоўныя сілы 15, 3, 16-й сав. армій з вялікімі стратамі адышлі ў раёны Ліпска, Беластока і Брэст-Літоўска. 4-я армія з 3-м конным корпусам і 2 дывізіі 15-й арміі, якія не змаглі прабіцца на ўсход, былі інтэрніраваны ва Усх. Прусіі. У ходзе В. а. сав. камандаванне спрабавала перакінуць на Зах. фронт 12-ю і 1-ю Конную арміі з Паўд.-Зах. фронту, аднак РВС Паўд.-Зах. фронту, лічачы сваёй гал. задачай авалодаць Львовам, затрымаў іх; вывад 1-й Конай арміі 15 жн. з-пад Львова і перакідка яе пад Люблін ужо не маглі выратаваць армій Зах. фронту.

Прычынамі паражэння сав. войск у В. а. была амаль двайная перавага сіл праціўніка, адрыў ад тылоў, няхватка рэзерваў. Аднак няўдача В. а. не мела рашаючага ўплыву на вынік вайны. Паражэнне польскіх войск на Беларусі і Украіне летам 1920 прымусіла ўрад Пілсудскага згадзіцца на заключэнне *Рыжскага мірнага дагавору 1921.*

Літ.: Кузьмин Н. Ф. Крушение последнего похода Антанты, М., 1958; Тухачевский М. Н. Поход за Вислу, Избр. произв., т. 1, М., 1964; Шапошников Б. На Висле, М., 1924.

С. З. Пачанін. Мінск.

ВАРШАЎСКІ ДАГАВОР 1955 аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе паміж Албаніяй, Балгарыяй, Венгрыяй, ГДР, Польшчай, Румыніяй, СССР і Чэхаславакіяй, падпісаны 14.5.1955 на Варшаўскай нарадзе еўрапейскіх дзяржаў па забеспячэнні міру і бяспекі ў Еўропе. Набыў сілу 5.6.1955. Тэрмін дзеяння — 20 гадоў з аўтаматычным працягам на 10 гадоў для тых удзельнікаў В. д., якія за год да сканчэння тэрміну не пададуць заявы пра дэнансацыю дагавору. Албанія пасля 1961 не ўдзельнічае ў рабоце арг-цыі краін В. д., а ў вер. 1968 яе кіраўнікі заявілі пра аднабаковы выхад з гэтай арг-цыі.

В. д. мае выключна абарончы характар і ставіць мэту падтрымаць мір і бяспеку ў Еўропе. Заключаны ў адказ на стварэнне агрэс. *Заходнееўрапейскага саюза* з удзелам ФРГ і ўключэнне яе ў *Арганізацыю паўночнаатлантычнага дагавору.* Да В. д. можа далучыцца кожная дзяржава, якая выкажа згоду сваім удзелам у дагаворы садзейнічаць міру і бяспецы народаў. Гэта прынцыпова адрозніває В. д. ад замкнёных імперыялістычных саюзаў. Для ўзаемных кансультацый і разгляду практычных пытанняў ажыццяўлення В. д. створаны Палітычны кансультатыўны камітэт (ПКК) з прадстаўнікоў усіх дзяржаў — удзельніц дагавору на ўзроўні кіраўнікоў камуніст. і рабочых партый і ўрадаў. Утворана аб'яднанае камандаванне (АК) узбр. сіламі, якія выдзелены паводле пагаднення паміж удзельнікамі В. д. ў распараджанне АК. На сесіі ПКК у Будапешце ў 1969 утвораны камітэт міністраў абароны. Арганізацыя краін В. д. спрыяе разрадцы міжнар. напружанасці. Дзяржавы — удзельніцы В. д. неаднойчы прапаноўвалі стварыць замест наяўных процілеглых ваенных груповак сістэму калектыўнай бяспекі ў Еўропе, заключыць пакт аб ненападзе паміж удзельнікамі НАТО і В. д. і інш., выказваліся за падтрымку барацьбы вызваленчага народа супраць агрэсіі ЗША, асудзілі агрэсію Ізраіля супраць арабскіх краін у 1967. Будапешцкая нарада ПКК (сак. 1969) прыняла Зварот да ўсіх еўрап. краін з новым заклікам правесці агульнаеўрапейскую нараду па пытаннях міру і бяспекі ў Еўропе.


Публ.: Варшавское совещание европейских государств по обеспечению мира и безопасности в Европе, М., 1955.

Літ.: Жуков Г. П. Варшавский договор и вопросы международной безопасности, М., 1961; Батов П. И. Надежный щит. К 10-летию заключения Варшавского договора, М., 1965.

М. М. Аваскаў, Э. М. Позняк. Мінск.

ВАРШАЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ, найбольшая навучальная ўстанова ў Польскай Народнай Рэспубліцы. Засн. ў 1818 паводле ўказа Аляксандра I у Варшаве як Аляксандраўскі ун-т з ф-тамі: юрыд., мед., прыгожых мастацтваў, прыродазнаўча-матэм. і тэалагічным. Пасля паўстання 1830—31 закрыты (1831). У 1862 адноўлены пад назвай Галоўнай школы. У ёй вучыліся пісьменнікі Г. Сянкевіч, Б. Прус, мовазнавец І. А. Бадуэн дэ Куртэнэ, гісторык матэматыкі С. Дзікштэйн і інш. У 1869 Галоўная школа ператворана ва ун-т з выкладаннем на рус. мове. У час ням. акупацыі 1915—17 фармальна лічыўся ням. ун-там, а з 1917 польскі ун-т. У 1917—39 у ім працавалі вядомыя матэматыкі В. Сярпінскі, З. Янішэўскі, С. Мазуркевіч; філосаф Т. Катарбінскі; сацыёлаг і грамадскі дзеяч Л. Кшывіцкі і інш. У час фаш. акупацыі Польшчы (1939—45) В. у. быў закрыты. Аднавіў сваю дзейнасць у 1945. У 1968/69 навуч. г. 11 ф-таў: юрыд., пед., філас., філал., паліт. эканомії, фіз., хім., геал., біял., гістар., фіз.-матэматычны; 19 тыс. студэнтаў, 1310 выкладчыкаў. Б-ка ун-та засн. ў 1817 (больш за 1,6 млн. тамоў, 1968). Пры ун-це кафедра бел. філалогіі.

ВАРЫЁМЕТР (ад лац. vario зменьваю + грэч. metron мера), 1) авіяцыйны паказальнік скорасці падняцця і спуску самалёта. Гэта дыферэнцыяльны манометр, які вымярае розпасць ціску навакольнага паветра і паветра ў корпусе прылады. 2) В. радыётэхнічны — сістэма шпуляў індуктыўнасці для плаўнай змены велічыні індуктыўнасці.



В. радыётэхнічны складаецца з дзвюх (радзей з чатырох) шпуляў (рыс. *а*): знешняй нерухомай (статарнай) і ўнутранай паваротнай (ротарнай). Шпулі злучаны паралельна ці паслядоўна. Пры павароце ротарнай шпулі паварочваецца і яе магн. поле, у крайніх становішчах яно ці супадае з полем статарнай шпулі, ці мае процілеглы кірунак. Агульнае магн. поле павялічваецца ці памяншаецца і адпаведна індуктыўнасць В. будзе найбольшая ці найменшая. Калі шпулі не злучаны, В. можна ператварыць у трансфарматар высокай частаты з пераменнай сувяззю (варыёкуплер). У фераварыёметрах (рыс. *б*) індуктыўнасць мяняецца пры перамяшчэнні магнітадыэлектрычнага стрыжня. Ужываюцца В. для настройкі тэле- і радыёпрыёмнікаў, выходных каскадаў генератараў у шырокім дыяпазоне частот, у прыладах для вымярэння індуктыўнасці.

ВАРЫКОЗНАЕ РАСШЫРЭННЕ ВЕН (варыкозная расшырэнне вен), хвароба вен, пры якой павялічваецца прасвет і змяняецца іх форма. Паражае вены ног, прамой кішкі, радзей стрававода і семявага канаціка. Развіваецца пераважна ў асоб 20—50-гадовага ўзросту ад слабасці сценак вен, застою або дрэннага аддёку крыві (пры сардэчнай недастатковасці, пухлінах, цяжарнасці). Найчасцей бывае ў людзей, праца якіх звязана з вял. фізічнымі напружаннямі або доўгім стаянием на нагах (повары, прадаўцы). Прыкметы: боль у нагах, хуткая стамляльнасць, ацёкі, набухлыя вены відны праз станчэлую скуру. Ускладненні: тромбафлебіт, трафічныя язвы на скуры ног. Пры невялікім расшырэнні вен на нагах рэкамендуецца насіць гумавыя панчохі або бінтаваць ногі эластычным бінтам; назначаюцца склерозавальныя сродкі (варыкацыд, варыказан і інш.). Пры значных расшырэннях — хірург. лячэнне; яно папярэджвае развіццё крывацёкаў, трафічных і полавых расстройстваў. Прафілактыка: лячэбная фізкультура, гімнастыка.

Літ.: Бондарчук А. В. Заболевания периферических сосудов, Л., 1969; Тальман И. М. Варикозное расширение вен нижних конечностей, Л., 1961 (бібліягр.).


М. І. Мішэнін. Мінск.

ВАРЫНСКІ (Waryński) Людвік (24.9.1856, с. Мартынаўка Канеўскага пав. Кіеўскай губ.— 13.2.1889), дзеяч польскага сацыяліст. руху. З дваран. У ліст. 1875 за ўдзел у выступленнях студэнтаў выключаны з Пецярбургскага тэхнал. ін-та. З восені 1876 вёў рэвалюц. прапаганду ў Варшаве. Удзельнічаў у напісанні першай праграмы польскіх сацыялістаў («Брусельская праграма», 1878). Стварыў першую рэвалюц. сацыяліст. партыю польскага рабочага класа *«Пралетарыят»* (1882), у якой з В. супрацоўнічалі выхадцы з Беларусі М. і Б. *Ануфровічы*, Т. Ю. Рахнеўскі і інш. 29.9.1883 арыштаваны, засуджаны (1885) на 16 гадоў катаргі. Памёр у Шлісельбургскай крэпасці.



ВАРЫЯЦЫЙНАЕ ВЫЛІЧЭННЕ, раздзел матэматыкі, які вывучае знаходжанне найбольшых і найменшых (экстрэмальных) значэнняў *функцыяналаў* (пераменных велічынь, залежных ад выбару адной ці некалькіх функцый). Задачы, якія даследуюць функцыянал на экстрэмум, наз. варыяцыйнымі.

В. в. пачало развівацца з канца 17 ст. і афармілася ў самастойную матэм. дысцыпліну з уласнымі метадамі даследавання пасля прац Л. Эйлера і франц. матэматыка Ж. Л. Лагранжа. Вялікі ўплыў на развіццё В. в. мелі наст. тры задачы: 1) пра брахістахрону — лінію, па якой матэрыяльны пункт за найкарацейшы час пад дзеяннем сілы цяжару скоціцца з пункта *A* у пункт *B* (рыс. *а*); 2) пра знаходжанне геадэзічнай лініі — найкарацейшай сярод усіх ліній, якія злучаюць два пункты на некаторай паверхні (рыс. *б*); 3) ізаперыметрычная задача, дзе траба знайсці замкнёную лінію пэўнай даўжыні, якая абмяжоўвае макс. плошчу. У аснове В. в. ляжыць паняцце варыяцыі (абагульненне паняцця дыферэнцыяла на выпадак функцыяналаў; гл. *Дыферэнцыяльнае вылічэнне*). З гэтым паняццем звязаны вельмі гібкі метад рашэння варыяцыйных задач — метад варыяцый Лагранжа. У апошні час пашырыліся прамыя метады, засн. на прыблізнай замене задачы В. в. задачай на адшуканне экстрэмальных значэнняў функцыі некалькіх пераменных. Распрацавалі, абгрунтавалі і дастасавалі прамыя метады ў значнай меры сав. матэматыкі Л. А. Люстэрнік, І. Г. Пятроўскі, М. А. Лаўрэнцьеў, М. М. Багалюбаў, М. М. Крылоў і інш. Далейшае развіццё В. в. звязана з функцыянальным аналізам, метады і



Літ.: История Польши, т. 2, М., 1955, с. 257—288; Baumgarten L. Dzieje Wielkiego Proletariatu, Warszawa, 1966 (гл. паказальнік імён).

ВАРЫСЦЫПСКАЯ СКЛАДКАВАСЦЬ, гл. *Герцынская складкавасць.*

ВАРЫЎНЯ, гаспадарчая зрубная будыніна ў беларускай вёсцы, дзе на зіму сляляне хаваюць бульбу, агародніну і садавіну. Абагравюць печкай-каменкай ці жарам. Часам прыбудоўваюць да сянец.

ВАРЫЯЦЫІ (лац. variatio змена), 1) у музыцы — цыклічная форма, якая складаецца з тэмы і яе відазмяненняў (уласна В.; адсюль інш. назва формы — тэма з В.). Бярэ пачатак у нар. мастацтве. Найчасцей сустракаецца ў інстр. музыцы. В. строгія (фактурныя) захоўваюць асн. контуры мелодыі і гармоніі тэмы, В. свабодныя (характарныя) значна адыходзяць ад тэмы, ствараюць кантрастныя ёй вобразы. Часам твор засноўваецца на вар'іраванні дзвюх тэм (двайныя В., напр., «Камарынская» М. Глінкі). Разнавіднасцю формы В. з'яўляюцца В. на нязменную тэму ў басе (Basso ostinato) і ўласцівыя рус. класічнай музыцы В. на нязменную мелодыю (т. зв. глінкаўскі тып В.). В. пішуцца на арыг. ці запазычаную («Рапсодыя на тэму Паганіні» С. Рахманінава, «Фантазія на тэму беларускай народнай песні «Юрачка» Дз. Камінскага) тэму. У гэтай форме могуць быць пабудаваны самастойныя п'есы і асобныя часткі вялікіх твораў: опер, сімфоній, санат і інш. 2) У балеце — кароткія віртуозныя сольныя танцы. Звычайна ўваходзяць у па дэ дэ, па дэ труа, гран па.

В. І. Ялатаў. Мінск.

ідэі якога шырока выкарыстоўваюцца ў В. в. Практычнае значэнне В. в. вялікае: многія асн. прынцыпы механікі і фізікі фармулююцца як варыяцыйныя (гл., напр., *Варыяцыйныя прынцыпы механікі*); шматлікія задачы матэм. фізікі ў розных прыкладных дысцыплінах (напр., задачы тэорыі кіравання) могуць быць вырашаны варыяцыйнымі метадамі.

Літ.: Лаврентьев М. А. и Люстерник Л. А. Курс вариационного исчисления, 2 изд., М.—Л., 1950; Смирнов В. И. Курс высшей математики, т. 4, 5 изд., М., 1958; Понтрягин Л. С. и др. Математическая теория оптимальных процессов, М., 1961. *Я. А. Іваноў.* Мінск.

ВАРЫЯЦЫЙНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ МЕХАНІКІ, матэматычныя суадносіны, якія выдзяляюць сапраўдны рух ці стан механічнай сістэмы з усіх кінематычна магчымых (г. зн. не забароненых накладзенымі на сістэму сувязямі). Выражаюцца роўнасцямі, у якія ўваходзяць варыяцыі каардынат, скорасцей або паскарэнняў пунктаў сістэмы (гл. *Варыяцыйнае вылічэнне*). Падзяляюцца на дыферэнцыяльныя і інтэгральныя. Дыферэнцыяльныя характарызуюць уласцівасці сапраўднага руху сістэмы ў кожны момант часу, а інтэгральныя — уласцівасці руху сістэмы за канечны прамежак часу.

Найбольш агульны прынцып статыкі несвабодных мех. сістэм — прынцып віртуальных (магчымых) перамяшчэнняў: для раўнавагі мех. сістэмы з ідэальнымі сувязямі (гл. *Сувязі механічныя*) сума элементарных работ усіх актыўных сіл ($\vec{F}_k$) пры розных магчымых перамяшчэннях ($\delta\vec{r}_k$) роўная нулю, г. зн. $\sum_{k=1}^{n} \vec{F}_k \delta\vec{r}_k = 0$. У дынаміцы карыстаюцца прынцыпам Д'Аламбера — Лагранжа: для сапраўднага руху мех. сістэмы з ідэальнымі сувязямі сума элементарных работ усіх актыўных сіл ($\vec{F}_k$) і даламберавых сіл інерцыі ($-m_k\vec{w}_k$) на розных магчымых перамяшчэннях ($\vec{\delta r}_k$) у кожны момант часу роўная нулю, г. зн. $\sum_{k=1}^{n}(\vec{F}_k - m_k\vec{w}_k)\vec{\delta r}_k = 0$, дзе $\vec{w}_k$ — паскарэнне k-тага пункта, m_k — яго маса. Сярод інтэгральных В. п. м. найбольшае дастасаванне мае прынцып найменшага дзеяння Гамільтана — Астраградскага: сапраўднае перамяшчэнне кансерватыўнай мех. сістэмы з пачатковай канфігурацыі (A_0) у іншую (A) адрозніваецца ад усіх кінематычна магчымых перамяшчэнняў гэтай сістэмы з A_0 у A за той жа прамежак часу $t - t_0$ тым, што для яго дзеянне паводле Гамільтана мае экстрэмальнае значэнне, г. зн. $\delta\int_{t_0}^{t} L dt = 0$, дзе L — функцыя Лагранжа, роўная розніцы паміж кінетычнай і патэнцыяльнай энергіяй сістэмы.

В. п. м. дазваляюць атрымаць ураўненні і заканамернасці руху мех. сістэм з аднаго агульнага палажэння і вызначаюць пэўную фіз. ўласцівасць, якая характарызуе сапраўдны рух сістэмы. В. п. м. можна распаўсюдзіць на многія інш. раздзелы тэарэт. фізікі.

Літ.: Полак Л. С. Вариационные принципы механики, М., 1960. *М. П. Халімановіч.* Мінск.

ВАРЭС Іаганес, гл. *Барбарус* Іаганес.

ВАРЭНІКІ, традыцыйная беларуская страва. Крутое цеста з пшанічнай, жытняй, грэчкай мукі, замешанае на малацэ, раскочваюць у тонкі ліст, рэжуць, начыняюць ягадамі, яблыкамі, грушамі, вішнямі, фруктовай сумессю, макам, мясам, рэпчатай цыбуляй, тварагом. Вараць у кіпні. Ядуць са смятанай, маслам, мёдам.

ВАРЭПА Іван Іосіфавіч [н. 1(14).5.1910, с. Пер'яценка Сяміпалацінскага пав.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1945. На фронце з 1943. Вызначыўся 26—27.9.1943 каля г. п. Камарын Палескай вобл. Пад агнём ворага з кулямётным разлікам фарсіраваў Дняпро, замацаваўся на плацдарме, адбіў 4 контратакі праціўніка, прыкрываў пераправу ўсіх падраздзяленняў. Жыве на радзіме.

ВАСАЛІТЭТ (франц. vassalité ад франкскага vassal леннік), сістэма залежнасці аднаго феадала ад другога ў перыяд сярэдневякоўя. З'явіўся ў дзяржавах германцаў, створаных на тэр. былой Зах. Рым. імперыі (5—6 ст.), дасягнуў росквіту ў Зах. Еўропе (9—10 ст.). Феадал атрымліваў за ваен. службу каралю зямлю, маёмасць ці інш. крыніцы даходаў. Пазней зямля стала гал. падараваннем, спачатку ў пажыццёвае карыстанне (*бенефіцый*), потым ва ўмоўнае трыманне (*феод*, ці *лен*). Буйныя феадалы — васалы вярхоўнага сеньёра (караля) мелі сваіх васалаў, драбнейшых феадалаў. З развіццём цэнтралізаваных дзяржаў, якія апіраліся на наёмныя арміі, В. пачаў траціць ваен. і палітычнае значэнне. Канчаткова знік пасля бурж. рэвалюцый. У Рус. дзяржаве васальныя адносіны існавалі толькі паміж вялікімі і ўдзельнымі князямі.

ВАСЕМНАЦЦАТАЯ ЎСЕСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ВКП(б), адбылася 15—20.2.1941. Удзельнічала 456 дэлегатаў з рашаючым і 138 з дарадчым голасам, якія прадстаўлялі 2 515 481 чл. і 1 361 404 канд. ў чл. партыі.

Парадак дня: 1) Аб задачах парт. арг-цый у галіне прамысловасці і транспарту (дакл. Г. М. Малянкоў); 2) Гаспадарчыя вынікі 1940 і план развіцця нар. гасп. СССР на 1941 (дакл. М. А. Вазнясенскі); 3) Арганізацыйныя пытанні.

Канферэнцыя сфармулявала канкрэтныя гасп.-паліт. задачы парт. арг-цый у галіне прамысловасці і транспарту: пастаянны кантроль за работай прадпрыемстваў і выкананне імі парт. дырэктыў; строгі ўлік, захаванасць і правільнае выкарыстанне абсталявання, матэрыялаў, сыравіны, паліва; удасканаленне і асваенне новай тэхнікі; падтрыманне тэхнал. дысцыпліны і рытмічнасці ў вытворчасці; выпуск дабраякаснай і камплектнай прадукцыі; зніжэнне сабекошту прадукцыі, умацаванне гасп. разліку; ажыццяўленне прынцыпу матэрыяльнага заахвочвання лепшых работнікаў; умацаванне адзінапачалля на прадпрыемствах. Для ўмацавання парт. кіраўніцтва прамысловасцю і транспартам канферэнцыя прызнала неабходным мець у гаркомах, абкомах, крайкомах ВКП(б), ЦК кампартый саюзных рэспублік сакратароў па асн. галінах прамысловасці і транспарту. Канферэнцыя адобрыла прыняты ЦК ВКП(б) і СНК СССР дзярж. план развіцця нар. гасп. на 1941, у якім асаблівая ўвага аддавалася ўмацаванню абароннай магутнасці краіны. Па арганізацыйным пытанні прыняла рашэнне «Аб абнаўленні цэнтральных органаў ВКП(б)».

21.2.1941 адбыўся Пленум ЦК ВКП(б), які адобрыў рашэнні XVIII канферэнцыі і выбраў кандыдатамі ў чл. Палітбюро ЦК М. А. Вазнясенскага, Г. М. Маляпкова, А. С. Шчарбакова.

М. М. Акімаў. Мінск.

ВАСЕМНАЦЦАТЫ З'ЕЗД ВКП(б), адбыўся ў Маскве 10—21.3.1939. Прысутнічала 1569 дэлегатаў з рашаючым і 466 з дарадчым голасам, якія прадстаўлялі 1 588 852 чл. партыі і 888 814 канд. ў чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачныя даклады — ЦК ВКП(б) (дакл. І. В. Сталін), Цэнтр. рэвізійнай камісіі (дакл. М. Ф. Уладзімірскі), дэлегацыі ВКП(б) у Выканкоме Камінтэрна (дакл. Дз. З. Мануільскі); 2) Трэці пяцігадовы план развіцця нар. гасп. СССР (дакл. В. М. Молатаў); 3) Змяненні ў Статуце ВКП(б) (дакл. А. А. Жданаў); 4) Выбары Камісіі па змяненні Праграмы ВКП(б); 5) Выбары цэнтр. органаў партыі.

З'езд падвёў вынікі дзейнасці партыі за папярэднія 5 гадоў, вызначыў задачы ў галіне знешняй і ўнутранай палітыкі. У сувязі з нарастаннем фаш. агрэсіі і патураннем ёй з боку зах. дзяржаў з'езд даў дырэктыву праводзіць палітыку міру і расшырэння дзелавых сувязей з усімі краінамі, умацоўваць абараназдольнасць СССР, міжнар. сувязі і дружбу з працоўнымі ўсіх краін. У аснову практ. дзейнасці па эканам. развіцці краіны з'езд паклаў рашэнне асн. эканам. задачы СССР — дагнаць і перагнаць найб. развітыя капіталіст. дзяржавы па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва. Важным крокам на шляху вырашэння гэтай задачы павінна была стаць 3-я пяцігодка (1938—42), план якой зацвердзіў з'езд. З'езд абвясціў пра ўступленне СССР у паласу паступовага пераходу ад сацыялізма да камунізма. Ён разгледзеў і некат. пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі пра сацыялізм. дзяржаву. Адзначыў, што дзяржава захаваецца і пры камунізме, калі не будзе ліквідавана капіталіст. акружэнне. Быў зацверджаны новы Статут ВКП(б), які адлюстроўваў карэнныя змены ў эканоміцы і класавай структуры сав. грамадства. Для ўсіх, хто ўступае ў партыю, вызначаліся адзіныя ўмовы прыёму і аднолькавы кандыдацкі стаж. У Статут унесены дадатак аб правах членаў партыі, уключаны раздзел «Партыя і камсамол». Паводле новага Статута адмяняліся масавыя чысткі партыі, вытворчым пярвічным парт. арг-цыям давалася права кантролю над дзейнасцю адміністрацыі.

З'езд выбраў камісію для выпрацоўкі новай Праграмы партыі ў складзе 27 чл., ЦК ВКП(б) у складзе 71 чл. і 68 канд. у чл. ЦК і Цэнтр. рэвізійную камісію ў складзе 50 чл. Пленум ЦК ВКП(б), які адбыўся 22.3.1939, выбраў выканаўчыя органы ЦК у складзе: 1) Палітбюро — А. А. Андрэеў, К. Я. Варашылаў, А. А. Жданаў, М. І. Калінін, Л. М. Кагановіч, А. І. Мікаян, В. М. Молатаў, І. В. Сталін, М. С. Хрушчоў; канд.— Л. П. Берыя, М. М. Швернік; 2) Сакратарыят — А. А. Андрэеў, А. А. Жданаў, Г. М. Маляпкоў, І. В. Сталін; 3) Аргбюро — А. А. Андрэеў, А. А. Жданаў, Л. М. Кагановіч, Г. М. Маляпкоў, Л. З. Мехліс, М. А. Міхайлаў, М. М. Швернік, А. С. Шчарбакоў.

Літ.: XVIII съезд Всесоюзной Коммунистической партии (б). 10—21 марта 1939. Стенографический отчет, [М.], 1939. *М. М. Акімаў.* Мінск.

ВАСЕМНАЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б, адбыўся 15—20.5.1940 у Мінску. Прысутнічала 577 дэлегатаў з рашаючым і 194 з дарадчым голасам, якія прадстаўлялі 36 388 чл. і 23 465 канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачныя даклады ЦК КП(б)Б (дакл. П. К. Панамарэнка) і Рэвізійнай камісіі КП(б)Б (дакл. В. Я. Сядых); 2) Выбары ЦК КП(б)Б і Рэвізійнай камісіі КП(б)Б.


Першы з'езд камуністаў рэспублікі пасля вызвалення Чырв. Арміяй у вер. 1939 Зах. Беларусі і ўз'яднання бел. народа ў адзінай Бел. сав. сацыяліст. дзяржаве. Падвёў вынікі дзейнасці Кампартыі Беларусі за 2 гады, якія мінулі пасля XVII з'езду КП(б)Б. Адзначыў, што парт. арг-цыі палепшылі кіраўніцтва народнай гасп., Саветамі, прафсаюзамі, камсамолам; умацавалі сувязі з працоўнымі масамі, у выніку гэтага дасягнуты поспехі ў развіцці прамысл., с. гасп., культуры. Выпуск прамысл. прадукцыі павялічыўся на 19,1%, прадукцыйнасць працы на 25,3%. Калгасы ўсх.-абласцей рэспублікі аб'ядноўвалі 92% сялянскіх гасп. і 97,6% ворнай зямлі, умацаваліся у арганіз. і гасп. адносінах, павялічылі вытв. прадукцыі. У зах. абласцях пачала наладжвацца работа прамысловасці, створаны першыя 480 калгасаў, 101 МТС. Павысіўся матэрыяльны і культурны ўзровень жыцця працоўных. З'езд падвёў вынікі першых рэвалюц. пераўтварэнняў і вызначыў далейшы план сацыяліст. буд-ва ў зах. абласцях Беларусі; падкрэсліў неабходнасць паляпшаць парт. кіраўніцтва развіццём прамысл., с. гасп., культуры. Улічваючы напружанае міжнар. становішча і пагранічнае размяшчэнне Беларусі, з'езд падкрэсліў неабходнасць умацоўваць абараназдольнасць зах. рубяжоў краіны, павышаць рэвалюц. пільнасць і мабілізацыйную гатоўнасць бел. народа. За справаздачны перыяд КП(б)Б умацавалася арганізацыйна, выросла ідэйна. У яе рады прынята 12 072 чл. і 26 745 канд. у чл. партыі, колькасць пярвічных партарганізацый павялічылася з 2336 да 4084, кандыдацкіх груп з 323 да 812.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выбраны ў складзе 69 чл. і 45 канд., Рэвізійная камісія — 29 чл. На пленуме, які адбыўся 20 мая, выбрана Бюро ЦК КП(б)Б (члены: К. В. Кісялёў, Ф. І. Кузняцоў, М. В. Кулагін, У. Н. Малін, А. П. Мацвееў, Н. Я. Наталевіч, П. К. Панамарэнка, Л. Ф. Цанава; кандыдаты: Р. М. Байкачоў, В. Я. Галоўкін, І. А. Крупеня, Р. Б. Эйдзінаў). Першым сакратаром ЦК КП(б)Б выбраны П. К. Панамарэнка, сакратарамі М. В. Кулагін, П. Р. Грэкава, У. Н. Малін, Р. М. Байкачоў.

Літ.: Пономаренко П. К. Отчетный доклад XVIII съезду КП(б)Б, Мн., 1940; Резолюция XVIII съезда Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии по отчетному докладу Центрального Комитета КП(б)В, Мн., 1940; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2 (1921—1966), Мн., 1967, с. 249—250. *І. С. Росман.* Мінск.

ВАСЕЎ Міхаіл Аляксандравіч (н. 10.5.1919, в. Разбілы Аханскага пав. Пермскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. Вызначыўся 23.12.1943 у баях на ПдУ ад Віцебска. Экіпаж танка пад камандай В. знішчыў 2 кулямёты, процітанкавае ружжо, 2 бліндажы і каля ўзвода пяхоты, прарваўся ў глыбіню варожай абароны на 10 км і каля в. Іванькіна адрэзаў немцам шлях да адступлення. У пяроўным баі танк быў падбіты, члены экіпажа паранены. У асаджаным танку экіпаж трымаўся 2 сутак і дапамог пяхоце авалодаць вёскай. Жыве ў Омску.

ВАСІЛЕВІЦКАЯ ДРЭС (Дзяржаўная раённая электрастанцыя), пабуда-



Агульны выгляд Васілевіцкай ДРЭС.

вана на поўдні рэспублікі ў г. Светлагорску (да 1961 г. п. Шацілкі). Буд-ва пачалося ў 1956 і абумоўлена патрэбай у электра- і цеплаэнергіі паўд. р-наў БССР, асабліва новых прамысл. цэнтраў (Светлагорск, Салігорск і інш.). Асн. паліва — вугаль Данецкага бас., фрэзерны торф і спадарожны нафтавы газ Асташкавіцкага радовішча нафты. Здадзена ў эксплуатацыю ў 1958. Да 1965 магутнасць перавысіла праектны ўзровень (200 тыс. *квт*) і дасягнула 300 тыс. *квт*. У 1958—69 выпрацавала 12,7 млрд. *квт·гадз* эл. энергіі. Уваходзіць у *Беларускую энергетычную сістэму*.

ВАСІЛЕВІЧ Алена Сямёнаўна (н. 22.12.1922, засценак Даманшчына Слуцкага пав.), беларуская савецкая пісьменніца. З сялян. Скончыла філал. ф-т БДУ (1946). З 1950 працуе ў час. «Работніца і сялянка». Друкуецца з 1947 (аповесць «У прасторах жыцця»). Першая кн. «Шляхі-дарогі» (1950) пра пасляваеннае буд-ва. Выдала зб. аповесцей, апавяданняў, нарысаў, некалькі кніжак для дзяцей. У цэнтры ўвагі пісьменніцы жыццё і праца сав. чалавека, праблемы побыту, сямейных узаемаадносін, выхавання дзяцей, сав. маралі. Аўтабіягр. матэрыял у аснове аповесцей «Расці, Ганька» (1966), «Доля цябе знойдзе» (1967), «Новы свет» (1968), «Пачакай, затрымайся...» (1970). Творам В. уласцівыя паэтычнае бачанне свету, дакладнасць у апісанні вясковага побыту.



Тв.: Блізкія знаёмыя, Мн., 1954; Заўтра ў школу, Мн., 1956; Сябры, Мн., 1958; Апавяданні, Мн., 1959; Падслухала сэрца, Мн., 1960; Калінавая кавічка, Мн., 1963; Я з вамі, Мн., 1964; Пісар Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Шкраба Р. Літаратура і мова, Мн., 1969, с. 304—316; Яго ж. Насустрач сваёй долі, «Полымя», 1969, № 2; Стральцоў М. Падказала сэрца, «Беларусь», 1960, № 9.

С. А. Андраюк. Мінск.

ВАСІЛЕВІЧ Іван Антонавіч (1894, мяст. Будслаў Віцебскай губ.— 29.12.1938), парт. і дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1918. У 1917—18 старшыня валвыканкома, намеснік, потым камісар па харчаванні Віленскай губ. З лют. 1919 нам. наркома харчавання Літоўска-Беларускай ССР, пасля да 1924 у органах Наркамата харчавання УССР. У 1925 нарком унутранага гандлю, у 1926 нарком фінансаў БССР. З вер. 1927 да кастр. 1930 другі сакратар, чл. Бюро ЦК КП(б)Б. З 1930 у органах Наркамзема СССР. З 1934 заг. сельгасаддзела і чл. Далёкаўсх. крайкома ВКП(б). Чл. ЦВК СССР (1925—30).



Г. І. Купрэева. Мінск.

ВАСІЛЕВІЧ Іван Іванавіч [18(30).6.1895, в. Падстарынь Слонімскага пав. Гродзенскай губ.— 25.8.1938], савецкі ваенны дзеяч. З сялян. Чл. КПСС з мая 1917. Скончыў Чугуеўскае ваен. вуч. (1916). У 1-ю сусв. вайну на Зах. фронце, прапаршчык. Пасля Лют. рэв. 1917 вёў рэвалюц. агітацыю сярод салдатаў. Удзельнік устанаўлення Сав. улады ў Тульскай губ. Пазней на парт. рабоце на Беларусі. Са снеж. 1918 у Чырв. Арміі, камісар палка. У 1921—23 нач. палітаддзела 17-й дывізіі. З 1929 нач. і ваенком *Аб'яднанай беларускай ваеннай школы*, з 1932 камендант умацаванага р-на, з 1936 камандзір 26-га стралковага корпуса Асобай Далёкаўсходняй арміі. Выбіраўся чл. ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР (1929—31). Узнаг. ордэнам Леніна. *М. І. Каміскі.* Мінск.

ВАСІЛЕВІЧ Рафаіл Людвігавіч [9(22).11.1903, в. Шарамятаўшчына Мінскага пав.— 17.9.1962], адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. У Чырв. Арміі з 1923. Скончыў Кіеўскую пях. школу (1928). У пач. Айч. вайны ўдзельнічаў у абароне Беларусі. З ліп. 1942 нам. камандзіра і камісар партыз. атрада. З мая 1943 нач. аператыўнага аддзела і нам. упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і БШПР па Івянецкім р-не. З снеж. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава* Баранавіцкай вобл. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

ВАСІЛЕВІЧ Яфрэм Пятровіч [22.1 (4.2).1901, в. Барысавічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 16.9.1965], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1929. Удзельнік бабуў супраць бандаў Булак-Балаховіча. З 1925 на парт. і гасп. рабоце. Напярэдадні вайны старшыня Расонскага райвыканкома. З ліп. 1941 у тыле ворага. З лют. 1942 у Паўн.-Зах. групе пры ЦК КП(б)Б. З 17.7.1942 нам. камандзіра,

з 1.11.1942 камісар *партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна* Віцебскай вобл. і сакратар Расонскага падпольнага РК КП(б)Б. У ліст. 1943 — студз. 1958 на парт. рабоце. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

ВАСІЛЕВІЧЫ, гар. пасёлак (з 1950) у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр пасялковага Савета і саўгаса «Васілевічы», чыг. ст. За 45 *км* на ПдЗ ад Рэчыцы, 86 *км* ад Гомеля. 10,7 тыс. ж. (1969). Мэблевая ф-ка, з-д масла і сухога малака, цагельня, хлебазавод, філіял Рэчыцкага камбіната быт. абслугоўвання, майстэрні для рамонту с.-г. тэхнікі, цэхі для вырабу безалкагольных напіткаў і каўбас, цэх прапітвання слупоў, лясгас, лесаўчастак Хойніцкага леспрамгаса. Сярэдняя і васьмігадовая школы, школа-інтэрнат, дзіцячыя сад і яслі, метэастанцыя, 2 б-кі, Дом культуры, кінатэатр, Дом піянераў, бальніца і паліклініка. У ваколіцах В. ялягае самы глыбокі на Палессі тарфянік. Нізіны на ім (калодзежы) наз. «ёўжынамі», «зоўжынамі». З 1878 тут існавала метэаралагічная станцыя для вывучэння клімату Палесся. Ваколіцы В. асушаны экспедыцыяй ген. І. І. *Жылінскага*. Інтэнсіўна забудоўваюцца пасля таго, як праклалі чыгунку.

ВАСІЛЕВІЧЫ, вёска ў Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Беларусь». За 22 *км* на ПнЗ ад Гродна, на шашы Гродна — Сапоцкіна. 392 ж., гасп. 124 (1970). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт. Брацкая магіла 9 воінаў-пагранічнікаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ВАСІЛЕВІЧЫ, вёска ў Васілевіцкім с/с Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 6 *км* на Пн ад Слоніма, 170 *км* ад Гродна, 8 *км* ад чыг. ст. Слонім. 357 ж., двароў 93 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, сталовая, магазін. Ням.-фаш. захопнікі спалілі ў В. 60 дамоў і расстралялі 111 жыхароў. Брацкая магіла 120 сав. воінаў і партызанаў Вял. Айч. вайны.

ВАСІЛЕВІЧЫ 2-я, нізінная балота ў Светлагорскім і Рэчыцкім раёнах Гомельскай вобл. Утварылася ад затарфоўвання мелкаводных вадаёмаў і ад сухадольнага забалочвання. У раслінным покрыве — асокі, гіпнавыя імхі, трыснёг, разнатраўе, хмызнякі вольхі (асабліва па краях). Пл. 18 164 *га*, сярэдняя глыб. 1,96 *м*, запасы торфу-сырцу 243,8 млн. $м^3$. Пераважныя віды торфу: асаковы, асакова-гіпнавы, драўняна-асаковы. У цэнтр. частцы торф на пл. 474 *га* падсцілаецца сапрапелю магутнасцю 0,7 *м*. З 1948 паліўная база Светлагорскай ЦЭЦ, часткова над с.-г. культурамі.

ВАСІЛЕНКА Галіна Канстанцінаўна (н. 18.8.1935, в. Будкі Нараўлянскага р-на Мазырскай акругі), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1966. З 1952 у калгасе «XXII з'езд КПСС» Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. З 1966 заг. жывёлагадоўчай фермы гэтага калгаса. Дэп. Вярх. Савета СССР 7-га скл.

ВАСІЛЕЎСКАЯ Ванда Львоўна (21.1.1905, Кракаў — 29.7.1964), савецкая пісьменніца і грамадская дзеячка. Пісала на польскай мове. Чл. КПСС з 1941. З сям'і паліт. дзеяча і этнографа. Скончыла Ягелонскі ун-т (1927), удзельнічала ў рэвалюц. руху і прагрэс. польскіх выданнях. З 1939 жыла ў СССР. Удзельніца Айч. вайны. У л-ры дэбютавала як паэтэса (1921). У аповесцях «Аблічча дня» (1934), «Зямля ў ярме» (1938) і ў рамане «Радзіма» (1935) паказала цяжкае жыццё сялян і рабочых у бурж. Польшчы, рост іх класавай, рэвалюц. свядомасці і барацьбу з эксплуататарамі. Трылогія «Песня над водамі» (1940—51, Дзярж. прэмія СССР 1952) расказвае пра нац.-вызв. рух на Валыні, змаганне ўкр. і польскіх працоўных супраць шляхты. Героіцы Айч. вайны прысвяціла аповесць «Радуга» (1942, Дзярж. прэмія СССР 1943). Аўтар аповесцей «Проста каханне» (1944, Дзярж. прэмія СССР 1946), «У цяжкай барацьбе» (1958), кніг нарысаў пра Францыю, Італію і інш. краіны. Творы В. перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжой. Была чл. Усеслав. камітэта, старшынёй Саюза польскіх патрыётаў у СССР (1943), адным з арганізатараў Войска Польскага, нам. старшыні Камітэта нац. вызв. Польшчы (1944), чл. Сусв. Савета Міру. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі, ордэнамі ПНР.



Тв.: Pisma zebrane, Warszawa, 1955; бел. пер. — Зямля ў ярме, «Полымя рэвалюцыі», 1939, № 2—3; рус. пер.— Собр. соч., т. 1—6, М., 1954—55.

Літ.: Венгеров Л. Ванда Василевская, М., 1955.

В. А. Чабаненка. Запарожжа.

ВАСІЛЕЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч [н. 18 (30).9.1895, с. Новапакроўскае Кінешамскага пав. Кастрамской губ.], савецкі ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1943). Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945). Чл. КПСС з 1938. У арміі з 1914; удзельнік 1-й сусв. вайны. У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. Да 1931 камандаваў стралковым палком. У 1931—36 на рабоце ў органах баявой падрыхтоўкі Наркамата абароны і ў Прыволжскай ваен. акрузе. Скончыў Акадэмію Ген. штаба (1937). З 1941 нам. начальніка, з 1942 нач. Ген. штаба і першы нам. наркома абароны. У 1942 каардынаваў дзеянні Паўд.-Зах., Данскога і Сталінградскага франтоў пад Сталінградам; у 1943 — Варонежскага і Сцяпнога франтоў у Курскай бітве; Паўд.-Зах. і Паўд. франтоў пры вызваленні Данбаса; у 1944 — 4-га Укр. фронту і Чарнаморскага флоту па вызваленні Крыма. У час *Беларускай аперацыі 1944* каардынаваў дзеянні 3-га Бел., 1-га і 2-га Прыбалтыйскіх франтоў. З лют. 1945 камандуючы 3-га Бел.



фронту. З чэрв. 1945 галоўнакамандуючы сав. войск на Д. Усходзе, кіраваў аперацыямі ў *савецка-японскай вайне 1945*. З 1946 нач. Ген. штаба і першы нам. міністра, з 1949 міністр Узброеных Сіл СССР. У 1953—57 нам. міністра абароны. З 1959 на кіруючай рабоце ў Мін-ве абароны СССР. На XIX і XX з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—4-га скл. Узнаг. 6 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 2 ордэнамі «Перамога», 4 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнамі замежных краін.

ВАСІЛЕЎСКІ Вячаслаў Савіч (1898, в. Чачарок Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 7.5.1920), удзельнік і арганізатар партыз. руху на Беларусі ў грамадз. вайну. З сялян. З 1915 у арміі. Пасля Люг. рэвалюцыі чырвонагвардзеец. У 1919—20 актыўна ўдзельнічаў у партыз. руху на Міншчыне. Схоплены польскімі інтэрвентамі і расстраляны.

ВАСІЛЕЎСКІ Іосіф Іосіфавіч [н. 26.11(9.12). 1911, г. Юзаўка], рускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1959. З сялян. Скончыў тэатр.-драм. курсы ў Мінску (1933). Быў акцёрам у т-рах Беларусі і Расіі. З 1967 у Мінску. Друкавацца пачаў у 1932. Аўтар зборнікаў вершаў, вершаваных кніг для дзяцей. Пераклаў на рус. мову паасобныя творы бел. паэтаў.

Тв.: Свершение, М., 1966; Птичья тревога, Мн., 1968; Пальмы и сосны, Мн., 1969.

ВАСІЛЕЎСКІ Пятро (Пётр Савельевіч; н. 15.5.1922, в. Сямёнаўка Клімавіцкага пав. Гомельскай губ.), беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1953). Працуе рэжысёрам на «Беларусьфільме». Друкуецца з 1942. Аўтар п'ес «Год дзевяцьсот семнаццаты» (1957), «Чалавек вярнуўся» (паст. 1959), «Любоў, Надзея, Вера...» (паст. 1960) і інш.

Тв.: Твой заўтрашні дзень. П'есы, Мн., 1968.



ВАСІЛЕЎСКІ Ягор Васілевіч (н. 1.1.1922, в. Гарбачова Віцебскага пав.), Герой Сав. Саюза (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Адэскую авіяшколу. У 1940—42 лётчык-інструктар Сталінградскай ваен. авіяшколы. На фронце з мая 1943. Удзельнік паветр. баёў пры вызваленні Белгарада, Харкава, Палтавы, Кременчуга, Румыніі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі. Зрабіў 296 баявых вылетаў; у 64 паветраных баях збіў 21 варожы самалёт. Жыве ў Віцебску.

ВАСІЛЕК, валошка (Centaurea), род адна-, двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Выш. 10—140 *см*. Лісце ланцэтналінейнае, цэласна-крайняе або перыста-рассечанае. Кветкі пурпуровыя, ружовыя, сінія, жоўтыя. Суквецце — кошык. Плод — сямянка з чубком. Вядома 550 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Амерыцы. У Аўстраліі 1 від. У СССР каля 180 відаў, на Беларусі 7. Найб. пашыраныя: В. сіні, або пасяўны (C. cyanus, нар. назвы: сіноўнік, хабёр, хабэрка) — пустазелле; В. лугавы (C. jacea, нар. назвы: раннік, цвяклоў лясны, шапашнік, мядзведжыя галоўкі), расце на лугах, палянах, між кустоў. Некат. віды (В. сіні, В. буйнакветны, В. мускусны) вырошчваюць як дэкаратыўныя, яны маюць садовыя разнавіднасці з махрыстымі і паўмахрыстымі кветкамі. Прэпараты з кветак В. сіняга ўжываюцца ў медыцыне.

ВАСІЛЕК Міхась [сапр. Касцевіч Міхаіл Восіпавіч; 1(14).11.1905, в. Баброўня Гродзенскага пав.— 3.9.1960], беларускі савецкі паэт. З сям'і лесніка. Сярэднюю адукацыю атрымаў у г. Казлове, дзе быў у бежанстве. У 1922 вярнуўся ў Зах. Беларусь. За рэвалюц. дзейнасць польскія ўлады шмат разоў арыштоўвалі В., саджалі ў турму. У 1939 мабілізаваны ў польскае войска, на фронце трапіў у ням. палон. Уцёкшы на радзіму (жн. 1941), наладзіў сувязь з партызанамі, быў сакратаром Скідальскага падпольнага антыфаш. камітэта, супрацоўнічаў у партыз. друку. Друкавацца пачаў (1926) у час. «Маланка». Выдаў у Вільні зб. грамадз. лірыкі «Шум баравы» (1929, канфіскаваны паліцыяй), «З сялянскіх ніў» (1937). У рамант.-прыўзнятых вобразах-сімвалах паэтызаваў вызв. барацьбу народа, выкрываў бурж. рэжым Польшчы. Радасць мірнай працы апяваў у паслявае. вершах.



Тв.: Выбраныя вершы, Мн., 1950; Выбраныя творы, Мн., 1955; Зоры над Нёманам, Мн., 1963.

Літ.: Калеснік У. А. Час і песні, Мн., 1962, с. 49—116; Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць, Мн., 1968, с. 53—58; Паслуцова М. «Я — усяго Васілёк...», у кн.: Наднёманскія былі, Мн., 1968. *У. А. Калеснік.* Брэст.

ВАСІЛЕНАК Яўген Пятровіч [н. 13(26).12. 1917, Орша], беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1945. З сям'і чыгуначніка. Вучыўся ў Магілёўскім пед. ін-це (1934—35). Працаваў у рэд. раённых газет (Шклоў, Барысаў, Багушэўск, Орша). У 1958—66 гал. рэдактар час. «Неман». Друкавацца пачаў у 1935. Выдаў зб. апавяданняў, нарысаў і аповесцей «Зялёныя агні» (1954), «Прызванне» (1956), «Выпадковы прыпынак» (1957), «Розныя дарогі» (1957), «Таццяна Ларына» (1964), п'есу з жыцця чыгуначнікаў «Каралеўскі гамбіт» (1957). Гал. тэмы творчасці — жыццё рабочага класа, горада. Творы В. пераклі. на рускую, украінскую і інш. мовы.

Тв.: Вячэрняя размова, Мн., 1968; Сімфонія са спагнаннем, Мн., 1969; Забыты вензель, Мн., 1970; З пройдзенай дарогі, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

ВАСІЛЁЎКА, вёска ў Красноўскім с/с Светлагорскага р-на Гомельскай вобл., на р. Бярэзіна (прыток Дняпра). Цэнтр калгаса «Перамога». За 50 *км* на ПнЗ ад Светлагорска, 160 *км* ад Гомеля, 22 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна. 429 ж., двароў 126 (1970). Пач. школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ВАСІЛЁЎКА 1-я, вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл. Падпарадкоўваецца Хоцімскаму пасялковаму Савету. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 5 *км* на З ад Хоцімска, 195 *км* ад Магілёва, 36 *км* ад чыг. ст. Камунары, каля шашы Хоцімск — Касцюковічы (3 *км*). 152 ж., двароў 61 (1970). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік-абеліск 28 жыхарам вёскі, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ВАСІЛЁЎКА 2-я, вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл. Падпарадкоўваецца Хоцімскаму пасялковаму Савету. Цэнтр калгаса «Перамога». За 10 *км* на Пн ад Хоцімска, 210 *км* ад Магілёва, 48 *км* ад чыг. ст. Камунары. 345 ж., двароў 103 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін, швейная майстэрня. Помнік-абеліск 61 жыхару вёскі, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ВАСІЛІШЫ, вёска ў Курапольскім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл., на р. Дзісна. Цэнтр калгаса «Уперад». За 30 *км* на Пн ад Паставаў, 280 *км* ад Віцебска. 469 ж., двароў 157 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАСІЛІШКІ, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Лебяда. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 32 *км* на Пн ад Шчучына, 85 *км* ад Гродна, 17 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы, на шашы г. п. Астрына — в. Баверка. 909 ж., дамоў 300 (1970). Пякарня, сепаратарны пункт, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік 2150 сав. грамадзянам, якіх загубілі ням. фашысты ў Айч. вайну.

ВАСІЛЬ I Дзмітрыевіч (1371—1425), вялікі князь маскоўскі [1389—1425], старэйшы сын *Дзмітрыя Іванавіча Данскога*. Жанаты з Соф'яй, дачкой вял. князя літ. Вітаўта. Да Маскоўскага княства далучыў у 1392 Суздальска-Ніжагародскае і Мурамскае княствы, у 1397—98 — Валок Ламскі, Бежацкі Верх, Волагду, Вялікі Усюг і землі комі. Для барацьбы з татарамі заключыў з Вял. кн. Літ. саюз (1392), які распаўся ў сувязі з захопам Вітаўтам у 1403—04 Смаленска і Вязьмы.

ВАСІЛЬ II Васілевіч Цёмны (1415—62), вялікі князь маскоўскі [1425—62], сын Васіля I Дзмітрыевіча і Соф'і, дачкі вял. князя літ. Вітаўта. Амаль 30 гадоў ваяваў з каліцкімі удзельных князёў, якую ўзначальваў галіцкі кн. Юрый Дзмітрыевіч, яго сыны Васіль Косы і Дзмітрый Шамяка. Вялікакняскі трон некалькі разоў пераходзіў да галіцкіх князёў, якіх падтрымліваў вял. князь літ. *Свідрыгайла*, Ноўгарад і часова Цвер. У 1446 аслеплены Шамякам (адсюль прозвішча Цёмны). Пры падтрымцы маск. баяр, дваран і пасадскіх людзей ліквідаваў большасць удзелаў у Маск. княстве, умацаваў вялікакняскую ўладу. Пры ім узмацнілася залежнасць ад Масквы Суздальска-Ніжагародскага княства, Наўгародскай феад. рэспублікі, Пскова і Вяткі; быў выбраны рускі мітрапаліт (1448), і рус. царква стала незалежнай ад канстанцінопальскага патрыярха, што ўмацавала міжнар. становішча Русі.

ВАСІЛЬ III Іванавіч (1479—1533), вялікі князь маскоўскі [1505—33], сын *Івана III* і Соф'і Палеалог. Змагаўся за цэнтралізацыю дзяржавы, за ўз'яднанне рус. зямель вакол Масквы, далучыў Пскоў (1510), Волацкі ўдзел (1513), Разанскае (1521), Ноўгарад-Северскае (1522) княствы. Выступаў супраць феад.-баярскай апазіцыі, да дзярж. кіраўніцтва залучаў дваран. Пасля смерці вял. князя літ. *Аляксандра* (1506), які быў жанаты з сястрою В. III Аленай, дамагаўся, каб яго выбралі вял. кн. у Літве. У 1507—08 і 1512—22 ваяваў з Літвою. 1.8.1514 з дапамогай Міхала Глінскага ўзяў Смаленск, але 8.9.1514 маскоўскія палкі былі разбіты Канстанцінам Астрожскім пад Оршай. Мірныя перагаворы 1517 не далі выпікаў, бо В. III патрабаваў далучэння да Маск. княства Кіева, Віцебска, Полацка і інш. Паводле перамір'я 1522 Смаленск астаўся за Масквою. В. III змагаўся супраць агрэсіі Крымскага і Казанскага ханстваў.

ВАСІЛЬ ІВАНАВІЧ ШУЙСКІ (1522—1612), рускі цар [1606—10]. З удзельных ніжагародска-суздальскіх князёў. Абвешчаны баярамі царом пасля забойства *Ілжэдзмітрыя I* (17.5. 1606). З вялікай цяжкасцю Шуйскаму ўдалося задушыць антыфеад. *сялянскую вайну пад кіраўніцтвам І. І. Балотнікава* (1606—07). Узмацніў прыгонніцтва, вызначыў тэрмін для пошукаў беглых сялян — 15 гадоў (улажэнне 9.3.1607). Для барацьбы з *Ілжэдзмітрыем II* і польскай інтэрвенцыяй заключыў саюз з швед. каралём Карлам IX (1609), якому аддаў г. Карэлу (Кексгольм) з паветам. 24.6.1610 пацярпеў паражэнне ад войск польскага караля Зыгмунта III Вазы. Палітыка Шуйскага выклікала незадаволенасць пар. мас, а таксама баярска-дваранскіх колаў, якія 17.7.1610, напярэдадні ўступлення ў Маскву польскіх войск, скінулі яго і пастрыглі ў манахі. Памёр у польскім палоне.

ВАСІЛЬЕВА А. Я. (г. н. і см. невяд.), беларускі этнограф, фалькларыст і краязнавец 2-й пал. 19 ст. Настаўнічала ў Пінску і інш. месцах Бел. Палесся. У працах даследавала побыт, матэрыяльную культуру, абрады, фальклор сялян, рабіла гісторыка-этнаграфічнае апісанне вёсак Мазыршчыны. Артыкулы «Вясельныя абрады ў раёне Грабаўскай воласці Мазырскага павета» (1877), «Нататка пра побыт сялян Мазырскага павета» (1879), «Веснавыя песні і абрады ў вёсках Мазырскага павета» (1878), «Вёска Бяседкі Мазырскага павета» (1879) надрукаваны ў «Минских губернских ведомостях», «Вытрымкі з жыцця беларускай жанчыны» (1880) — у «Виленском вестнике».

ВАСІЛЬЕВА Зінаіда Анатолеўна [н. 16(29). 12.1913, Пецярбург], беларуская і руская сав. балерына і педагог. Нар. арт. БССР

(1940). Пасля сканчэння Ленінградскага харэаграф. вуч. (1933) салістка т-ра імя Кірава і Малога т-ра оперы і балета ў Ленінградзе, Вялікага т-ра СССР, у 1937—49 — Бел. т-ра оперы і балета. Першая выканаўца на бел. сцэне партый Ванды («Салавей» М. Крошнера), Адэты-Адыліі («Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага), Марыі («Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева), Каламбіны («Арлекінада» Р. Дрыга), Лізы («Марная засцярога» П. Л. Гертэля; у 1944 В. паставіла гэты балет). З аднолькавай маст. пераканальнасцю выконвала лірыка-драм. і камедыйныя ролі. Творчая дзейнасць В. арабіла вялікі ўплыў на развіццё класічнага танца ў бел. балеце. У 1937—49 педагог і першы маст. кіраўнік Мінскага харэаграф. вучылішча. Прытрымліваўся пед. сістэмы сваёй настаўніцы А. Ваганавай. У 1950—61 балетмайстар - педагог у Новасібірскім і Адэскім оперных т-рах, у 1962—65 педагог Нацыянальнай балетнай школы ў Каіры (ААР). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».





З. А. Васільева і К. А. Мулер у сцэне з балета «Бахчысарайскі фантан».

Літ.: Модэль М. Мастак класічнага танца — Зінаіда Анатольеўна Васільева, у яго кн.: Народныя артысты БССР, Мн., 1948.

А. І. Каладзенка. Мінск.

ВАСІЛЬЕВЫ (псеўд. братьі Васільевы), савецкія кінарэжысёры і сцэнарысты: Георгій Мікалаевіч (25.11.1899, Волагда — 18.6.1946), засл. дз. маст. РСФСР (1940) і Сяргей Дзмітрыевіч [22.10(4.11).1900, Масква — 16.12.1959], нар. арт. СССР (1948). Першая сумесная работа — дакумент. фільм «Подзвіг у льдах» (1928). Узорам палітычна страснага і псіхалагічна глыбокага кінематаграфічнага мастацтва сацыяліст. рэалізму стаў сусветна вядомы «Чапаеў» (1934, Дзярж. прэмія СССР 1941). Грамадз. вайна — тэма фільмаў В. «Валачаеўскія дні» (1937), «Абарона Царыцына» (1942, 1-я серыя, Дзярж. прэмія СССР 1942). Апошняя сумесная стужка — «Фронт» (1943). У 1955 С. Васільеў з балг. кінематаграфістамі паставіў гістар. фільм «Героі Шыпкі»; у 1958 фільм «У дні Кастрычніка». Г. Васільеў узнаг. ордэнам Леніна і ордэнам Чырв. Зоркі, С. Васільеў — ордэнам Леніна і 2 інш. ордэнамі.

Літ.: Парфенов Л. Братья Васильевы, «Искусство кино», 1963, № 3.

ВАСІЛЬЕЎ Васіль Аляксеевіч [н. 21.12.1907 (3.1.1908), пас. Іванішчы Судагодскага пав. Уладзімірскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1946. У Чырв. Арміі з 1931; скончыў Маскоўскую ваен. школу сувязі (1933). З 1940 нач. сувязі палка ў Беластоку. У 1941 удзельнічаў у абароне Беластока, Ваўкавыска, Слоніма. З сак. 1942 камандзір партыз. групы, з жн. камандзір атрада, з крас. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя У. І. Леніна* Пінскай вобл. З жн. 1944 на парт.-сав. рабоце ў Пінску. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Пінску.

ВАСІЛЬЕЎ Васіль Паўлавіч [20.2(4.3).1818, Ніжні Ноўгарад — 27.4(10.5).1900], рускі кітаязнавец, спецыяліст па будызме. Акад. Пецярбургскай АН (1886, чл.-кар. 1866). Распрацоўваў пытанні гісторыі, літаратуры, філасофіі, рэлігіі Кітая, гісторыі і геаграфіі краін усх. часткі Сярэд. Азіі. Упершыню ў Еўропе даследаваў фанетыку, марфалогію і пісьмо Кітая. Склаў першыя ў свеце дапаможнікі для вывучэння кіт. мовы («Графічная сістэма кітайскіх іерогліфаў. Вопыт першага кітайска-рускага слоўніка», 1867). Сусветна вядомая праца В. «Будызм, яго догматы, гісторыя і літаратура» (ч. 1, 3, 1857—69).

Літ.: Горбачева З. И. и др. Русский китаевед академик Василий Павлович Васильев (1818—1900), у кн.: Очерки по истории русского востоковедения, сб. 2, М., 1956 (бібліягр.).

ВАСІЛЬЕЎ Іван Васілевіч [10(23).11.1906, с. Вышгарад Порхаўскага пав. Пскоўскай губ.— 5.7.1962], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1931. У Чырв. Арміі з 1928. Полк, якім камандаваў В., у чэрв. 1944 пад Бабруйскам 5 дзён вёў цяжкія баі і прычыніў значныя страты ворагу.

ВАСІЛЬЕЎ Мікалай Мікалаевіч (4.6.1923, с. Ніжні Ісецк Екацярынбургскага пав. Пермскай губ.— 17.1.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў вер. 1943 каля г. п. Камарын Палескай вобл. Наводчык узвода процітанкавых ружжаў мал. сяржант В. у час контратакі праціўніка падбіў 3 танкі; фарсіраваў Дняпро, сабраў каштоўныя звесткі пра ворага. Загінуў у баі.

ВАСІЛЬЕЎ Мікалай Фёдаравіч (н. 1924, с. Улінкер Чыцінскай акр. Забайкальскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Вызначыўся 23.6.1944 каля в. Рог Даманавіцкага р-на Палескай вобл. Разлік гарматы пад камандаваннем В. за 12 гадзін разам з пяхотай адбіў 10 контратак праціўніка. 7.7.1944 у баі за Баранавічы цяжка паранены, але падтрымліваў артыл. агнём наступленне сав. пяхоты. Прапаў без вестак.

ВАСІЛЬЕЎ Рыгор Арцёмавіч [н. 23.11(5.12). 1885, Жлобін], удзельнік рэвалюц. руху ў Забайкаллі. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з

1906. Працаваў слесарам дэпо чыг. ст. Верхнеудзінск (Улан-Удэ). Па заданні Чыцінскага к-та РСДРП вёў рэвалюц. прапаганду сярод салдатаў, разам з інш. сацыял-дэмакратамі стварыў рэвалюц. ваенны саюз. Двойчы арыштаваны. 4 гады прасядзеў у Акатуйскай катаржнай турме, з 1911 у паліт. ссылцы ў Якуцку. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі на гасп. рабоце ў Гомелі. У грамадз. вайну на Зах. фронце. З 1922 камісар, упаўнаважаны Упраўлення Бел. чыгункі, кіраўнік па забеспячэнні чыгуначнай магістралі Турксіб. З 1935 у ін-це Транстэхпраект Мін-ва шляхоў зносін. Аўтар успамінаў «З рэвалюцыйнага мінулага» (Улан-Удэ, 1968). Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Жыве ў Маскве.



ВАСІЛЬЕЎ Сяргей Піліпавіч [н. 19.6(2.7). 1904, г. Вязьма], адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1946. Працаваў на чыгунцы, у Наркамаце земляробства РСФСР. У Чырв. Арміі з 1932. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У пач. Айч. вайны ўдзельнічаў у абароне Ліды. Са жн. 1942 партызан, з кастр. камандзір партыз. групы, з чэрв. 1943 нач. штаба атрада, з ліст. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя С. М. Кірава* Баранавіцкай вобл. З чэрв. 1944 на сав.-гасп. рабоце. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў пас. Глуша Бабруйскага р-на.

ВАСІЛЬЕЎ Фёдар Аляксандравіч [10(22).2. 1850, Гатчына — 24.9(6.10).1873], рускі жывапісец-пейзажыст. У 1867 скончыў школу пры Т-ве заахвочвання мастацтваў у Пецярбурзе. Творчасць В. ўзбагаціла рус. пейзажны жывапіс паэт. адухоўленасцю. Яго карціны, тонкія па настроі, рамантычна ўсхваляваныя, напісаны чыстымі насычанымі фарбамі: «Вясковая вуліца», «Перад навальніцай» (абедзве 1868), «Краявід на Волзе» (1871), «Мокры луг» (1872), «У крымскіх гарах» (1873). Найб. значны твор — «Адліга» (1871), які прынёс мастаку поспех у Расіі і за мяжою. Тры работы В. ў Дзярж. маст. музеі БССР.



Літ.: Федоров-Давыдов А. А., Ф. А. Васильев, М., 1955.

ВАСІЛЬЕЎКА, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Гагарына. За 30 *км* на ПдУ ад Добруша, 50 *км* ад Гомеля, 10 *км* ад чыг. ст. Церахоўка. 1862 ж., двароў 665 (1970). Сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, адд. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік і мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 280 воінаў-землякоў, а таксама 2 брацкія магілы сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАСІЛЬЕЎСКІ Васіль Рыгоравіч [21.1(2.2). 1838—13(25).5.1899], рускі гісторык-візантыніст. Акадэмік Пецярбургскай АН (1890, чл.-кар. 1876). Першы з гісторыкаў 19 ст. выкарыстаў візант. матэрыял для вырашэння складаных пытанняў гісторыі сярэдніх вякоў, асабліва перыяду крыжовых паходаў. Пачынальнік даследавання ўнутранай, пераважна аграрнай гісторыі Візантыі. Даказаў існаванне ў 8—9 ст. вольнай сялянскай абшчыны, значны ўплыў славян на грамадскі лад Візантыі. Трымаўся ідэаліст. пазітывісцкай метадалогіі, кансерватыўных поглядаў, аграрную гісторыю Візантыі разглядаў у адрыве ад класавай барацьбы. Заснаваў час. «Византийский временник» (1894).

Тв.: Труды, т. 1—4, СПб.— Л., 1908—30.

Літ.: Список трудов В. Г. Васильевского, «Византийский временник», 1899, т. 6, в. 1—4, с. 652—658.

ВАСІЛЬКА (г. н. і см. невяд.), слонімскі князь 13 ст. Упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1281. У саюзе з валынскім кн. Уладзімірам Васількавічам і інш. памагаў Кандрату, кн. мазавецкаму, у міжусобнай барацьбе з Баляславам Мазавецкім.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т. 2 — Ипатьевская летопись, М., 1962.

ВАСІЛЬКІ, князі Полацкай зямлі 12 ст. Летапісы паведамляюць, што ў 1132 палачане выбралі князем Васільку, сына Святаслава Усяславіча, унука Усяслава Брачыславіча (Полацкага). У сувязі з пераходам Віцебска да Смаленскага княства ў апошняй чвэрці 12 ст. ўпамінаецца Васілька Брачыславіч, князь віцебскі. Лагойскі кн. Васілька Валадаравіч у саюзе з наўгародцамі і смалянамі ў 1186 удзельнічаў у паходзе на Полацк.

Літ.: Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 1 (т. 1—2), М., 1962.

ВАСІЛЬКІ, вёска ў Ноўкінскім с/с Віцебскага р-на. Цэнтр калгаса «Прагрэс». За 18 *км* на Пд ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Старое Сяло, 4 *км* ад Зах. Дзвіны, каля шашы Віцебск — Бешанковічы (3 *км*). 186 ж., двароў 52 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка.

ВАСІЛЬКОВА Таццяна Вяргееўна (н. 25.10. 1933, в. Янава Свяцілавіцкага р-на Гомельскай вобл.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1966. З 1954 даярка калгаса імя Леніна Гомельскага р-на. Узнаг. ордэнам Леніна.

ВАСІЛЬКОЎ, вёска ў Дуброўскім с/с Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «12 гадоў Кастрычніка». За 35 *км* на З ад Рэчыцы, 85 *км* ад Гомеля, 10 *км* ад чыг. раз'езда Крынкі. 428 ж., двароў 142 (1969). Пач. школа, клуб, магазін. У Айч. вайну ням. фашысты спалілі вёску, загубілі 53 жыхароў.

ВАСІЛЬКОЎ Іосіф Георгіевіч (27.2.1879, г. Ялец Арлоўскай губ.— 23.8.1942), беларускі савецкі батанік. Праф. (1920). Скончыў Маскоўскі ун-т (1904). У 1920—29 заг. кафедры

батанікі Горацкага с.-г. ін-та (з 1925 Беларуская с.-г. акадэмія). З 1926 правадз. чл. Ін-та бел. культуры. З 1934 працаваў у Ін-це біялогіі АН БССР. Аўтар прац па флоры Еўрап. ч. СССР, Каўказа, Казахстана. Друкаваў спісы флоры Беларусі і ўдзельнічаў у падрыхтоўцы выдання «Флора БССР».

Тв.: О новом для московской флоры виде папоротника, «Известия Московского сельскохозяйственного ин-та», 1915, т. 21, кн. 3; Матэрыялы да флоры Горацкага раёна, «Праца навуковага таварыства па вывучэнню Беларусі пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі ў Горках», 1927, т. 3.

ВАСІЛЬКОЎ Мікалай Карнілавіч [н. 10(23).4.1902, Віцебск], савецкі ваенны дзеяч, ген.-л. артылерыі (1954). З рабочых. Чл. КПСС з 1921. У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў Ваен.-тэхн. акадэмію імя Дзяржынскага (1931). У 1934—36, 1938—41 выкладчык і нач. лабараторыі Ваен. артыл. акадэміі імя Дзяржынскага. У Айч. вайну на Сталінградскім, Варонежскім, Цэнтр., 1-м Укр., Паўд., 1-м Бел. франтах: камандзір асобнай брыгады ППА, корпуса ППА. З 1945 на адказных пасадах у войсках ППА. У 1959—62 нам. нач. Ваен.-камандзір акадэміі ППА. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.



ВАСІЛЬКОЎКА, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. За 1,5 *км* на ПдЗ ад В., ва ўрочышчы Тартак, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры*. Даследавалася А. Р. Мітрафанавым. Пры раскопках выяўлены сляды жытлаў слупавой канструкцыі, знойдзены рэшткі ляпных штрыхаваных і гладкасценных пасудзін, жал. сярпы, нажы, шылы, падковападобныя фібулы, гліняныя прасліцы, каменныя зверыцёркі, абломкі тыгляў, жал. шлакі, крыцы, косці свойскіх і дзікіх жывёл. Насельніцтва займалася лядным земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, апрацоўкай жалеза, дрэва і косці, прадзівам, ткацтвам і інш. Грамадскі лад — патрыярхальная абшчына. За 0,5 *км* на Пн ад В. гарадзішча-сховішча, за 1—2 *км* — два курганныя могільнікі з трупаспаленнем (каля 30 курганоў). *А. Р. Мітрафанаў.* Мінск.

ВАСІЛЬЧАНКА Аляксандр Пракопавіч [н. 21.3(2.4).1885, Сноўск Чарнігаўскай губ.], удзельнік рэвалюцыі 1905—07, Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны. З 1904 чл. *Гомельскай арганізацыі РСДРП(б)* і яе к-та, бальшавік. Адзін з арганізатараў 13-дзённай забастоўкі чыгуначнікаў ст. Сноўск у перыяд Усерасійскай паліт. стачкі ў кастр. 1905, чл. стачачнага к-та, камісар аховы парадку. Сасланы ў Забайкалле, не спыняў рэвалюц. дзейнасці, няраз сядзеў у турмах. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі, чл. Савета рабочых і салдацкіх дэп. ва Уладзівастоку. У грамадз. вайну ўдзельнік ліквідацыі мяцяжу чэхаславацкага корпуса, падпольшчык, сувязны паміж далёкаўсходнімі чыгуначнікамі і чырв. партызанамі. З 1922 працаваў ва Уладзівастоку, з 1960 жыве ў г. Шчорс (б. Сноўск).

ВАСІЛЯ БЛАЖЭННАГА ХРАМ (Пакроўскі сабор) у Маскве, выдатны помнік рускай архітэктуры. Пабудаваны ў 1555—60 у гонар перамогі над Казанскім ханствам (дойліды Барма і Поснік). Храм складаецца з 8 асобных цэркваў (7 прысвечаны дням, якія вырашылі лёс вайны), размешчаных вакол высокай шатровай вежы на агульным высокім фундаменце. Цэрквы злучаны ўнутранымі пераходамі. У 1588 прыбудаваны прыдзел Васіля Блажэннага. У 80-я г. 17 ст. ганкі і «гульбішча» вакол храма накрыты дахам і пабудавана шатровая званіца. Рэстаўрыраваны ў 50-я г. (адноўлена першапачатковая афарбоўка фасадаў). Апошняя рэстаўрацыя закончана ў 1970. Храм вызначаецца прыгажосцю сілуэта, закончанасцю прапорцый, багатым убраннем фасадаў, адыгрывае важную ролю ў ансамблі Краснай плошчы, філіял Дзяржаўнага гістарычнага музея.

Літ.: Соболев Н. Н. Василий Блаженный (Покровский собор). [Альбом], М., 1949; Снегирев В. Л. Памятник архитектуры — храм Василия Блаженного, М., 1953. *П. М. Максімаў.* Масква.

Храм Васіля Блажэннага ў Маскве.



ВАСКАБОЙНІКАЎ Васіль Міхайлавіч (н. 9.8.1923, г. Лебядзін Харкаўскай губ.), беларускі савецкі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1967), праф. (1968). Чл. КПСС з 1947. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Харкаўскі вет. ін-т (1948). У 1951—55 асістэнт кафедры хірургіі гэтага ін-та. З 1955 у Віцебскім вет. ін-це; з 1968 прарэктар па навук. рабоце. Даследаваў фізіялогію і паталогію родаў, распрацаваў метады лячэння гінекалагічных хвароб с.-г. жывёл. Працы па пытаннях барацьбы з ялавасцю і бясплоднасцю, па ўкараненні ў практыку жывёлагадоўлі штучнага асямянення.

Тв.: (Разам з Губарэвічам Я. Р.) Экспериментально-клинические данные о действии питуитрина и хлористого кальция на матку коров, у кн.: Доклады советских ученых к V Международному конгрессу по биологии воспроизведения и искусственному осеменению животных, М., 1964; Экспериментальные и клинические данные о действии новокаина на сократительную деятельность матки коров, у кн.: Зооветеринарная наука и производство, Мн., 1969 (Уч. зап. Витебского ветеринарного ин-та, т. 21).

ВАСКОВАЯ МОЛЬ, агнёўка пчаліная вялікая (Galleria mellonella), начны матыль сям. агнёвак. Даўж. 15—20 *мм*, размах крылаў 22—35 *мм*. Пярэднія крылы папялісташэрыя з цёмнымі крапінкамі, заднія святлейшыя. Адкладвае яйцы ў смецце на дно і ў шчыліны вуллёў, на соты. З яец выводзяцца брудна-белыя з карычневай галавою вусені (клочні), якія кормяцца воскам сотаў і коканамі пчол (ператвараюць іх у труху). На Беларусі В. м. пашырана і вельмі шкодзіць пчалярству. Меры барацьбы: ачыстка вуллёў, сістэматычная замена старых сотаў у пчаліных сем'ях, акурванне рамак серай у закрытым будынку.

Літ.: Гусельников А. Л. Пчеловодство, 4 изд., М., 1960.

ВАСКОВЫ ЖЫВАПІС, энкаўстыка (ад грэч. enkáiō выпальваю), тэхніка жывапісу, заснаваная на выкарыстанні воску як сувязнога рэчыва для фарбаў. Існуюць гарачы спосаб (энкаўстыка), калі пішуць растопленымі фарбамі, і халодны, калі воск растваряюць у лятучых алеях (васковая тэмпера). Васковыя фарбы трывалыя, на іх амаль не дзейнічаюць час і вільгаць. В. ж. быў вядомы ў Ст. Егіпце, антычнай Грэцыі, Рыме (вызначаюцца *фаюмскія партрэты* ў эліністычным Егіпце 1—4 ст.), у Візантыі (іканапіс да 12 ст.). У тэхніцы В. ж. працуюць некат. сучасныя мастакі, ім карыстаюцца пры рэстаўрацыях.

Літ.: Хвостенко В. В. Энкаустика, 2 изд., М., 1967.

ВАСЛЁПКА, возера ў бас. р. Лужаснянкі, правага прытока Зах. Дзвіны, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,85 *км*². Даўж. 3,5 *км*, найб. шыр. 1,2 *км*, сярэдняя 0,5 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (14 *км*²) узгорыста-марэнны. Злучана пратокай з воз. Вымна. Водзяцца плотка, акунь, шчупак, ёрш.

ВАСНЯЦОВЫ, рускія мастакі, браты.

Віктар Міхайлавіч [3(15).5.1848, с. Лоп'ял Вяцкай губ.— 23.7.1926], жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай акад. мастацтваў (1868—74), акадэмікам якой выбраны ў 1893. Чл. Т-ва перасоўнікаў з 1878. Спачатку вядомы як жанрыст вострa сацыяльнага кірунку («Жабракі пяюць», 1873; «З кватэры на кватэру», 1876, і інш.). У 1878 пераехаў у Маскву, зблізіўся з абрамцаўскім гуртком С. І. Мамантава. У 1881—85 стварыў у нар.-паэтычным стылі дэкарацыі да «Снягурачкі» А. Астроўскага (дамашні т-р Мамантава ў Абрамцаве); у 1885 — фрыз «Каменны век» для Гістар. музея, шэраг партрэтаў (І. Пятрова, 1883; Т. Мамантавай, 1884, і інш.). Манумент.-дэкар. роспіс Уладзімірскага сабора ў Кіеве (1885—96) не пазбаўлены стылізацыі і афіц. характару. Галоўнае ў спадчыне В.— творы на сюжэты нар. эпасу і казак. Карціны «Пасля пабоішча Ігара Святаславіча з полаўцамі» (1880), «Аленка» (1881), «Цар Іван Васілевіч Грозны» (1897), «Асілкі» («Богатыри», 1898) і інш. пачынаюць нац. рамантычны кірунак у рус. рэаліст. жывапісе. У Дзярж. маст. музеі БССР 10 работ. Сярод іх: «Партрэт сына», «Узлесак» (эцюд да «Аленкі», 1880—81), «Тры царэўны падземнага царства» (1884).



Апалінарый Міхайлавіч [25.7(6.8).1856, с. Рабава Вяцкай губ.— 23.1.1933], жывапісец і рысавальшчык-пейзажыст. Вядомы як археолаг, педагог і тэарэтык мастацтва. Акад. Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1900). Вучыўся ў брата, В. М. Васняцова. Чл. Т-ва перасоўнікаў (з 1889). З 1903 узначаліў «Саюз рус. мастакоў». У 1901—18 кіраваў пейзажным класам Маск. вучылішча жывапісу, ваяння і дойлідства. Пачынальнік гістар. пейзажа, заснаванага на маст. асэнсаванні матэрыяльных крыніц, дакументаў і выданняў. Аўтар эпічных палотнаў «Радзіма» (1886), «Паўночны край» (1890), «Сібір» (1894), «Возера» (1902); серыі гісторыка-археал. твораў («Масква пачатку 17 ст.», 1900, і інш.). 14 работ у Дзярж. маст. музеі БССР. Сярод іх: «Вясенняя цішыня» (1881), «Дняпро перад бурай», «Горнае возера. Урал» (1892).

Літ.: Моргунов Н. и Моргунова-Рудницкая Н. Виктор Михайлович Васнецов, М., 1962; Беспалова Л. Аполлинарий Михайлович Васнецов. 1856—1933, М., 1956.

ВАСТОКАЎ Аляксандр Хрыстафаравіч [16(27).3.1781, г. Арансбург Ліфляндскай губ.— 8(20).2.1864], рускі моваэнавец і паэт. Акад. (1841). Еўрап. вядомасць В. прынеслі «Разважанні пра славянскую мову» (1820). У «Апісанні рускіх і славенскіх рукапісаў Румянцаўскага музеума» (1842) даў палеагр. і лінгвіст. характарыстыку 473 рукапісаў розных слав. рэдакцый. Выдаў (1843) з лінгвіст. каментарыямі і слоўнікам найстараж. (1056—57) слав. помнік «Астраміра ва евангелле». Адрэдагаваў другі т. «Слоўніка царкоўнаславянскай і рускай мовы» (1847), «Спробу абласнога вялікарускага слоўніка» (1852) і «Да-

датак» да яго (1858). Аўтар «Слоўніка царкоўнаславянскай мовы» (т. 1—2, 1858—61) і «Граматыкі царкоўнаславянскай мовы» (1863). «Дослед пра рускае вершаскладанне» (1812) — адно з першых навук. даследаванняў сістэмы рус. танічнага вершаскладання.

Тв.: Стихотворения, Л., 1935; Заметки А. Х. Востокова о его жизни. [Сообщил В. И. Срезневский], СПб., 1901.

Літ.: Виноградов В. В. Синтаксические воззрения А. Х. Востокова и их значение в истории русского языкознания, «Известия АН СССР. Отделение языка и литературы», в. 2, 1951; Орлов В. Н. Русские просветители 1790—1800 годов, 2 изд., М., 1953.

ВАСТРАЦОЎ Сцяпан Сяргеевіч [17(29).12.1883, в. Казанцава Бірскага пав. Уфімскай губ.— 3.5.1932], савецкі ваен. дзеяч, герой грамадз. вайны. З сялян. Чл. КПСС з 1920. У арміі з 1906. За рэвалюц. агітацыю сярод салдатаў у 1909 засуджаны на 3 гады астрогу. Удзельнік 1-й сусв. вайны. У Чырв. Арміі з 1918. Камандзір 242-га Волжскага палка 27-й Омскай дывізіі, вызначыўся на Усх. і Зах. франтах у 1919—20. Удзельнік вызвалення Чэлябінска, Омска, Нованікалаеўска, Мінска, Баранавіч, Слоніма, Ваўкавыска. У 1921 узначальваў Упраўленне войск ВЧК па ахове граніц Сібіры. Увосень 1922 удзельнік штурму Спаска. У 1924—29 камандзір дывізіі, в 1929 — корпуса. Чл. ЦВК БССР (1927—29). Узнаг. 4 ордэнамі Чырв. Сцяга, ганаровай рэвалюц. зброяй.

Літ.: Тимофеев Е. Д. Степан Вострецов, М., 1966; Кладт А. П. Он землю родную пошел защищать, М., 1966.

ВАСТРЫЦА (Asperugo), род аднагадовых травяністых раслін сям. бурачнікавых. Сцябло сакаўное з калючкамі, сцелецца, даўж. 15—60 *см*. Лісце падоўжанаэліптычнае, з валаскамі. Кветкі дробныя, адзіночныя або па 2—3 у пазухах верхніх лістоў, спачатку фіялетавыя, потым блакітныя. Плод — арэшак. Вядомы адзін від — В. распасцёртая (A. procumbens), пашыраны ў Еўропе, Азіі і Паўн. Амерыцы. Пустазелле.



ВАСТРЫЦЫ (Enterobius), род паразітычных чарвей класа нематод. Даўж. 2—5 *мм* (самцы) і 9—12 *мм* (самкі). Паразітуюць у кішэчніку чалавека (E. vermicularis) і млекакормячых жывёл. Жывуць каля 1 месяца. Заражэнне бывае, калі ў кішэчнік з ежай пападаюць яйцы В. Інтэнсіўнае заражэнне выклікае цяжкую хваробу — энтэрабіёз.

ВАСЬКАВІЧЫ, вёска ў Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Максіма Горкага. За 8 *км* на ПдЗ ад Слаўгарада, 82 *км* ад Магілёва, 51 *км* ад чыг. ст. Быхаў, 10 *км* ад прыстані Слаўгарад (на р. Проня), на шашы Брэст — Рослаўль — Масква. 348 ж., двароў 131 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ВАСЬКАВІЧЫ, вёска ў Цемравіцкім с/с Чавускага р-на Магілёўскай вобл., на р. Раста. Цэнтр калгаса «Перадавік». За 25 *км* на ПнЗ ад Чавусаў, 43 *км* ад Магілёва, 15 *км* ад чыг. ст. Раста. 349 ж., двароў 132 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАСЬКАУШЧЫНА, вёска ў Веравайтанскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Заслонава. За 5 *км* на ПнЗ ад Оршы, 98 *км* ад Віцебска. 259 ж., двароў 75 (1970).

ВАСЬМІГАДОВАЯ ШКОЛА, няпоўная сярэдняя агульнаадукацыйная працоўная політэхнічная школа. Уведзена замест сямігадовай законам «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай асветы ў СССР» (1958). 8.4.1959 сесія Вярх. Савета БССР зацвердзіла Закон аб школе ў Беларусі. В. ш. ажыццяўляе бясплатнае абавязковае сумеснае навучанне і выхаванне дзяцей ад 7 да 15—16 гадоў уключна, дае ім асновы агульнаадукацыйных і політэхн. ведаў, ажыццяўляе маральнае, працоўнае, фіз. і эстэт. выхаванне, выхоўвае гатоўнасць да грамадска карыснай дзейнасці.

Навучанне і выхаванне вядзецца паводле зацверджаных Мін-вам асветы БССР планаў і праграм, у якія ўваходзяць: рус. і бел. мова і л-ра, гісторыя, геаграфія, матэматыка, фізіка, хімія, прыродазнаўства, біялогія, чарчэнне, замежная мова, выяўленчае мастацтва, спевы і музыка, фіз. культура, працоўнае выхаванне. Перавод вучняў з класа ў клас у В. ш. ажыццяўляецца па гадавых адзнаках ведаў. У канцы 8-га класа праводзіцца выпускныя экзамены па роднай і рускай мовах і матэматыцы. Выпускнікі атрымліваюць пасведчанне пра адукацыю і права вучыцца ў старэйшых класах сярэдняй школы, сярэдніх спец. навуч. установах, гарадскіх і сельскіх прафесійна-тэхн. вучылішчах або працаваць на вытворчасці і адначасова вучыцца ў вячэрніх (зменных) ці завочных школах. В. ш. кіруе дырэктар з дапамогай пед. савета, партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый, органаў дзіцячага самакіравання. У СССР у 1969/70 навуч. г. ў 1—8 класах васьмігадовых і сярэдніх школ навучалася 40 457,5 тыс. вучняў, у т. л. ў БССР 1520,3 тыс.

Літ.: Киселев Г. Я. Развитие народного образования в Белоруссии за годы Советской власти, Мн., 1967. *М. П. Дарафеенка.* Мінск.

ВАСЮКІ, вёска ў Сольскім с/с Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Гвардыя». За 10 *км* на З ад Смаргоні, 250 *км* ад Гродна, 4 *км* ад чыг. ст. Солы, каля шашы Мінск — Вільнюс (1,5 *км*). 261 ж., двароў 85 (1970). Торфапрадпрыемства «Валэйкавічы». Васьмігадовая і нач. школы, клуб, б-ка, магазін. На брацкай магіле помнік сав. танкістам, якія загінулі ў нач. Айч. вайны.

ВАСЮЦІН Якаў Дамітрыевіч [н. 12(25).4.1912, в. Камароўцава Новаскольскага пав. Курскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Курскую выш. камуніст. школу (1937). У 1938—40 на камсамольскай рабоце. З 1940 у Чырв. Арміі. У Айч. вайну ўдзельнічаў у абароне Мінска. У лют. 1942 арганізаваў партыз. групу, потым атрад, якія дзейнічалі ў Баранавіцкай вобл. У вер. 1942 атрад ператвораны ў *партызанскую брыгаду «За Савецкую Беларусь»* Баранавіцкай вобл. (камандзір В.). Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

ВАСЮЦІНСКІ Антон Афодзьевіч (Фёдаравіч; 1858, Магілёў — 1935), скульптар-медальер. У 1881—88 вучыўся ў Пецярбургскай акад. мастацтваў, акадэмікам медальернага мастацтва якой стаў у 1908. У 1889 выехаў за мяжу, вучыўся ў Ж. К. Шаплена. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў старшым медальерам Пецярбургскага манетнага двара. Сярод работ: «Медаль рус. т-ва птушкагадоўлі» (1886), «Геркулес, які забівае трохгаловую гідру» (1888) і інш. У 1925 стварыў бронзавую планкету «Апошняе падполле У. І. Леніна ў 1917 г. ў Разліве».

ВАТ, адзінка вымярэння магутнасці ў сістэме СІ, роўная магутнасці, пры якой раўнамерна выконваецца работа ў 1 *джоўль* за 1 *сек*. Назва паходзіць ад імя англ. вынаходніка Дж. Уата (1736—1819). Абазначаецца *вт* ці *W*. Магутнасць эл. току ў 1 *вт* ствараецца пастаянным токам велічынёй 1 *ампер* пры напружанні 1 *вольт*. Ужываюцца кілават (1000 *вт*) і мегават (1 000 000 *вт*).

ВАТА (ад ням. Watte), слаба ўшчыльненыя прыродныя ці штучныя валокны, пераплеценыя паміж сабой і ачышчаныя ад дамешак. Вырабляецца з валокнаў жывёльнага (шарсцяная, шаўковая, пуховая), раслінnага (баваўняная, ільняная, пяньковая, цэлюлозная) і мінер. паходжання (азбеставая, шкляная, металічная, шлакавая, базальтавая). Па прызначэнні В. з валокнаў жывёльнага і раслінnага паходжання (натуральная) падзяляецца на вопраткавую, мэблевую, тэхнічную, пракладачную, медыцынскую. Мінеральная В. (штучная) шырока ўжываецца ў буд-ве як цепла- і гукаізаляцыйны матэрыял, для фільтрацыі вадкасцей і газаў у хім. прамысловасці. Для ўцяплення вопраткі служыць вацін — заменнік В. У БССР баваўняную В. выпускаюць Антопальскі райпрамкамбінат (швейную і тэхнічную), Аршанская льнопрадзільная ф-ка, Віцебская ваціна-ватная ф-ка (тэхнічную), мінеральную — Гомельскі і Мінскі камбінаты буд. матэрыялаў.

Літ.: Горяйнов К. Э. Технология минеральной ваты и изделий из нее, М., 1958; Китайцев В. А. Технология теплоизоляционных материалов, 2 изд., М., 1964.

ВАТАГІН Васіль Аляксеевіч [20.12.1883 (1.1.1884), Масква — 31.5.1969], рускі савецкі скульптар і графік, адзін з заснавальнікаў анімалістычнага жанру ў рускім савецкім мастацтве. Нар. маст. РСФСР (1964). Правадз. чл. Акадэміі маст. СССР (1967). Вучыўся ў студыі К. Юона (1903—06) і адначасова на прыродазнаўчым ф-це Маск. ун-та (1902—07). Вядомы як ілюстратар навук. работ па заалогіі і геаграфіі, а таксама дзіцячых кніг. Стварыў скульптуры і карціны для Дзярж. дарвінаўскага музея і Заалагічнага музея Маск. ун-та. Аўтар галерэі «партрэтаў» дзікіх звяроў («Гімалайскі мядзведзь», 1925; «Галава львіцы», 1952, і інш.), вроблены з глыбокім веданнем прыроды звера, яго паводзін. Дзярж. прэмія СССР 1952.

Тв.: Изображение животного. Записки анималиста, М., 1957.


Літ.: Василий Алексеевич Ватагин, М., 1956.

ВАТАЦЫ Ніна Барысаўна [н. 1(14).5.1908, г. Вендэн Ліфляндскай губ.], беларускі савецкі бібліёграф. Засл. дз. культ. БССР (1963). З сям'і юрысконсульта. Чл. КПСС з 1945. Скончыла БДУ (1930), працуе ў Дзярж. б-цы БССР. У Айч. вайну заг. б-кі эвакашпіталя ў г. Мелекесе (Ульянаўская вобл.). З 1945 гал. бібліёграф Дзярж. б-кі БССР імя Леніна. Друкуецца ў бібліягр. часопісах з 1932. Асн. працы па бібліяграфіі асобных выданняў бел. л-ры. Выявіла і апублікавала некалькі невядомых тэкстаў М. Багдановіча. У 1964 знайшла рукапісны зб. яго вершаў (аўтограф) на рус. мове «Зеленя». Склала (з А. Лойкам) літ. альбом пра жыццё і творчасць М. Багдановіча (1968).

Тв.: (Бібліягр. даведнікі) Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі, Мн., 1962; Беларускае літаратуразнаўства і крытыка, Мн., 1964; Беларуская савецкая драматургія, Мн., 1966; Янка Купала, Мн., 1953; Кузьма Чорны, Мн., 1954; Пятро Глебка, Мн., 1957; Міхась Лынькоў, Мн., 1959; Максім Багдановіч, Мн., 1961; (з М. Пратасевічам і М. Базаравічам) Якуб Колас, Мн., 1962; Кандрат Крапіва, Мн., 1963.

ВАТ-ГАДЗІНА, пазасістэмная адзінка вымярэння работы і энергіі, роўная рабоце, якая выконваецца пры пастаяннай магутнасці 1 *ват* за 1 *гадз*. Абазначаецца *вт·гадз* ці W·h. 1 *вт·гадз* =3600 *джоўлям*. Ужываюцца гектават-гадзіна (100 *вт·гадз*), кілават-гадзіна (1000 *вт·гадз*) і мегават-гадзіна (1 000 000 *вт·гадз*).

ВАТМЕТР, прылада для вымярэння магутнасці электрычнага току (у ватах, кілаватах, мегаватах). Мае два вымяральныя ланцугі: адзін уключаецца паслядоўна, як *амперметр*, другі — паралельна нагрузцы, як *вальтметр*.



В. вымяраецца актыўная магутнасць аднафазнага і трохфазнага току, а таксама рэактыўная магутнасць трохфазнага току. Для трохфазнага току В. мае два ці тры вымяральныя элементы ў адным корпусе. Пры пастаянным току В. карыстаюцца як рэгістрацыйнай прыладаю. У ланцуг высокага напружання В. уключаецца праз вымяральныя трансфарматары напружання і току, чым прадугледжваецца бяспека і пашырэнне межаў вымярэння. Існуюць В. электрадынамічнай (пераносныя), ферадынамічнай і індукцыйнай вымяральных сістэм (шчытавыя) і інш.

ВАТО (Watteau) Антуан (10.10.1684, Валансьен — 18.7.1721), французскі жывапісец і графік. Адзін з заснавальнікаў франц. рэаліст. мастацтва 18 ст. З 1702 у Парыжы. Вучыўся ў К. Жыло і К. Адрана. Сярод ранніх работ жанравыя карціны, сцэны ваен. побыту («Цяжкасці вайны» і інш.). У 1712—17 піша на тэмы жыцця тэатра («Акцёры італьянскай камедыі», каля 1712), прыдворных колаў («Панства ў парку», каля 1716—18; «Свята кахання», паміж 1717 і 1719; «Капрызніца» і інш.). За карціну «Адплыццё на востраў Цытэру» (1717) Каралеўская акадэмія надала



яму званне «мастака галантных святаў». Творы В. (у т. л. апошніх гадоў: «Жыль», 1719—21; «Шыльда крамы Жэрсена», 1720) вызначылі новы кірунак франц. мастацтва — паэтызацыю і інтымнасць сюжэта, грацыёзнасць жаночых вобразаў, вытанчанасць празрыстых пейзажаў. Вял. маст. каштоўнасць маюць малюнкі В. (сангіна, аловак).

Літ.: Чегодаев А. Д. Антуан Ватто, М., 1963; Антуан Ватто. Альбом, М.—Л., 1961.

ВАТУЦІН Мікалай Фёдаравіч [3(16).12.1901, с. Чапухіно Курскай губ.— 15.4.1944], савецкі ваенны дзеяч. Ген. арміі (1943). Герой Сав. Саюза (1965). З сялян. Чл. КПСС з 1921. У Чырв. Арміі з крас. 1920. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1929), Акадэмію Ген. штаба (1937). У 1937 нам. начальніка, у 1938 нач. штаба Кіеўскай асобай ваен. акругі. З 1939 да 1941 нам. начальніка Ген. штаба Чырв. Арміі. У Айч. вайну нач. штаба Паўн.-Зах., Паўд.-Зах. і Бранскага франтоў; камандуючы войск Паўд.-Зах., Варонежскага і 1-га Укр. франтоў. Войскі на чале з В. абаранялі Варонеж, удзельнічалі ў Сталінградскай і Курскай бітвах, вызвалялі Левабярэжную і Правабярэжную Украіну; 6.11.1943 вызвалілі Кіеў. Пахаваны ў Кіеве, яму там пастаўлены помнік. Роднае сяло і саўгас на радзіме названы імем В. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



ВАТЫКАН (Stato della Città del Vaticano), тэакратычная горад-дзяржава ў зах. частцы Рыма, адм. ц. рымска-каталіцкай царквы і рэзідэнцыя яе кіраўніка — папы рымскага. У пераносным сэнсе В.— вярхі каталіцкай царквы на чале з папам (гл. *Каталіцызм*). Займае пагорак Монтэ-Ватыкана. Пл. 0,44 км². Нас. каля 1 тыс. чал. Афіц. мова лацінская. В.— самы вялікі ў свеце трымальнік акцый (каля 6 млрд. долараў); маюць акцыі банкаў Італіі, Францыі, Швейцарыі, ЗША. Залатыя і валютныя запасы В. ацэньваюцца ў 12 млрд. долараў. У Італіі яму належыць 465 тыс. га зямлі, у ФРГ 250 тыс. га. На тэр. В. вялікія радыёстанцыя і друкарня. Грашовая адзінка — ліра В.

Гісторыя В. як цэнтра каталіцкай царквы пачалася ў перыяд ранняга сярэдневякоўя (гл. *Папства*). Дзяржава В. ўзнікла ў 1929 на аснове Латэранскага пагаднення, заключанага паміж папам Піем XI і фаш. урадам Італіі. Паводле пагаднення Італія перадала папскаму трону горад В. у «поўную ўласнасць» і пад «выключную і абсалютную ўладу і суверэнную юрысдыкцыю». В. аб'яўлены нейтральнай дзяржавай. Неабмежаваным манархам В. з'яўляецца папа рымскі, які выбіраецца пажыццёва калегіяй кардыналаў з ліку кардыналаў. Яму належыць заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлада. З 1963 папа — Павел VI. Для непасрэднага кіравання дзяржавай папа прызначае губернатара са свецкіх асоб. Асн. законам В. з'яўляецца канапічнае права, у дадатак да якога дзейнічаюць асобныя пастановы папы і некаторыя дзярж. законы Італіі. В. мае сваю армію (наёмная швейцарская гвардыя, каля 100 чал.), жандармерыю (каля 100 чал.) і для ўрачыстых цырымоній збірае папскую дваранскую гвардыю з прадстаўнікоў рымскай арыстакратыі і ганаровую палацінскую гвардыю з рымскай буржуазіі. Мае дыпламат. адносіны з многімі дзяржавамі свету, у т. л. з такімі, дзе найбольш пашыраны нехрысціянскія рэлігіі — Пакістанам, Іранам, ААР, Іракам, Японіяй, Турцыяй і інш. Роля В. ў міжнар. адносінах вызначаецца тым, што ён з'яўляецца міжнар. цэнтрам каталіцкай царквы, якая мае сваіх паслядоўнікаў амаль ва ўсіх краінах свету (паводле звестак В. каля 620 млн. чал.). Палітыку В. ажыццяўляюць каталіцкае духавенства (больш за 400 тыс. чал. у 1968), манаскія ордэны (каля 1,2 млн. чал.). Пад яго ўплывам знаходзяцца шматлікія свецкія арг-цыі: каталіцкія партыі ў краінах Зах. Еўропы, Амерыкі, Афрыкі, прафсаюзы, арг-цыі моладзі, жанчын і інш. Паліт. роля В. вызначаецца таксама яго эканам. магутнасцю.

Вышэйшыя іерархі каталіцкай царквы варожа прынялі Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыю, актыўна падтрымалі ворагаў першай сацыяліст. дзяржавы. Пазней В. настойліва ажыццяўляў палітыку антыкамунізму, стаў саюзнікам фаш. рэжыму Італіі, Германіі, Іспаніі. У час 2-й сусв. вайны займаў пазіцыю, спрыяльную для агрэсараў, вёў палітыку стварэння адзінага фронту бурж. дзяржаў супраць СССР. Пасля разгрому фаш. дзяржаў у 2-й сусв. вайне В. пераарыентаваўся на саюз з імперыяліст. коламі ЗША, рэваншыстамі ФРГ і рэакц. сіламі інш. краін. Развіццё сусв. рэвалюц. працэсу, які выклікаў усебаковае паслабленне пазіцый В., а таксама незадаволенасць шырокіх мас веруючых і частак нізавога духавенства рэакц. паліт. курсам В. вымусілі вярхі каталіцкай царквы прыстасоўваць сваю паліт. лінію да новай сітуацыі

Л. Берніні. Скала Рэджа ў Ватыкане.



ў свеце. У час праўлення папы *Іаана XXIII* [1958—63] пачалася змена курсу. В. адыходзіць ад адкрытай падтрымкі імперыяліст. дзяржаў, выступае за мірнае суіснаванне краін з розным грамадскім ладам, за захаванне міру ва ўсім свеце (гл. *Ватыканскія саборы*). В. мае магутны прапагандысцкі апарат, які выкарыстоўваецца для прапаганды рэлігіі, для барацьбы з камуніст. ідэалогіяй, з рэвалюц. рухам ва ўсім свеце. Пад яго кантролем больш за 30 каталіцкіх ун-таў (у Рыме, Вашынгтоне, Лёвене, Ліёне, Аставе, Парыжы, Мілане, Неймегене, у краінах Паўд. Амерыкі і інш.), сярэднія і нізэйшыя школы ў ЗША, Францыі, Італіі, Іспаніі, ФРГ, Бельгіі, Нідэрландах і інш. краінах. Цэнтр. орган друку В.— штодзённая газ. «L'Osservatore Romano» («Рымскі аглядальнік»). Каталіцкая царква выдае ў розных краінах больш за 1000 газет і часопісаў на 50 мовах. «Радыё Ватыкана» заснавана ў 1931. Вядзе перадачы на 31 мове. Папская Акадэмія навук у сучасным стане існуе ў В. з 1936.

Арх. комплекс В. ўключае сабор св. Пятра [пачаты Д. Брамантэ (1506—14), работы працягвалі Мікеланджэла (1546—64), Дж. Віньёла (1564—85), Дж. дэла Порта (1586—93), К. Мадэрна (1607—14) і інш.; у інтэр'еры — «Аплакванне Хрыста» Мікеланджэла (каля 1497—98)], аднайменную плошчу з каланадай Л. Берніні (1657—63) і папскі палац з музеямі, куды ўваходзяць: капэлы Мікалая V (40-я г. 15 ст.) і Сікстынская (1473—84, з фрэскамі Мікеланджэла), двор Сан-Дамаза (каля 1510, Брамантэ) з Лоджыямі Рафаэля, двор Бельведэра (1503—45, пачаты Брамантэ), апартаменты Борджа з сумежнымі Станцамі Рафаэля, Скала Рэджа (1663—66, Берніні), карпусы 6-кі (1587—90), музеі Піо-Клеменціна (1769—74) і К'ярамонці (1817—22). У садах В.— рэшткі гарадскіх сцен часоў Льва IV (9 ст.), кавіно Пія IV (1558, П. Лігорыо), Ватыканская пінакатэка.

Літ.: Ковальский Н. А. Католицизм и дипломатия, М., 1969; Его ж. Ватикан и мировая политика, М., 1964; Шейнман М. М. От Пия IX до Иоанна XXIII, М., 1966; Лаврецкий И. Р. Ватикан, М., 1957; Markiewicz S. Polityka Jana XXIII i Pawła VI, 2 wyd., Warszawa, 1964.

Дз. М. Мацяс (гісторыя). Мінск;
Г. І. Апачынская (архітэктура). Масква.

ВАТЫКАНСКІЯ САБОРЫ, сходы (з'езды) вышэйшых іерархаў каталіцкай царквы ў Ватыкане.

І В. с. (ці XX Усяленскі, гл. *Усяленскія саборы*) скліканы папам Піем IX у 1869—70, неўзабаве пасля апублікавання рэакц. дакумента каталіцкай царквы — «*Сілабуса*» (1864). Сабор праходзіў ва ўмовах абвастрэння класавых супярэчнасцей капіталізму, уздыму рэвалюц. рабочага руху, распаўсюджання марксізма. Услед за «Сілабусам» сабор асудзіў найважнейшыя навук., паліт. і філас. плыні і ідэі новага часу і найперш камунізм, абвясціў ісцінай толькі каталіцкую рэлігію. Сабор зацвердзіў догматы пра бога — творцу свету з нічога, пра цуды, пра першынство веры над розумам, рэлігіі над навукай, прыняў адзін з гал. догматаў каталіцызму — пра бязгрэшнасць папы (калі ён гаворыць як настаўнік «усіх хрысціян» па пытаннях веры і маралі) і інш.

ІІ В. с. (ці XXI Усяленскі) быў скліканы папам *Іаанам XXIII* (кіраваў 1-й сесіяй) і канчаў работу пад кіраўніцтвам папы Паўла VI. Сесіі сабору праходзілі на працягу 4 гадоў: 11.10—8.12.1962, 29.9—4.12.1963, 14.9—21.11.1964 і 11.9—7.12.1965. У перапынках паміж сесіямі працавалі шматлікія камісіі. Сабор быў заняты пошукамі шляхоў прыстасавання каталіцызму да сучаснасці, адзначаўся рэвалюц. сац.-паліт. пераўтварэннямі ў свеце, распаўсюджаннем ідэй камунізма і навукова-тэхн. адкрыццямі. Прыстасаванне да патрэб часу, на думку большасці сабору, павінна спрыяць перадоленню крызісу рэлігіі ў сучасным свеце. Сабор зацвердзіў рэформу літургіі (імшы), каб яна была больш вразумелая веруючым, прыняў рашэнне пра экуменізм (збліжэнне хрысціянскіх цэркваў) і супрацоўніцтва каталіцкай царквы з нехрысціянскімі цэрквамі, пра задачы царквы ў сучасным свеце (у адносінах да сац. праблем, барацьбы за мір, навук. прагрэсу, праблемы атэізму і г. д.). Рашэнні сабору маюць на мэце зрабіць каталіцызм больш гібкай рэлігіяй, узброіць яго вытанчанымі сродкамі ўздзеяння на людзей.

Літ.: Вопросы научного атеизма, в. 6—II Ватиканский собор, М., 1968 (бібліягр.); Фалькони К. Ватиканский собор и причины его созыва, пер. с итальян., М., 1964; Casanova A. Vatican II et l'évolution de l'Eglise, Paris, 1969.

Дз. М. Мацяс. Мінск.

ВАТЭРЛОО (Waterloo), населены пункт у Бельгіі, за 20 км на Пд ад Бруселя, дзе 18.6.1815 адбылася бітва паміж англа-галандска-прускай арміяй і франц. войскамі Напалеона І. Франц. армія пацярпела паражэнне (з 72 тыс. было забіта 32 тыс. салдатаў), што з'явілася апошнім знішчальным ударам для напалеонаўскай імперыі. Напалеон здаўся англічанам і быў высланы на в-аў Св. Алены. У Францыю зноў вярнуліся *Бурбоны*.

ВАЎЧАК Міхаіл Антонавіч [29.10(11.11). 1908, пас. Іздзешкава Вяземскага пав. Смаленскай губ.— 24.10.1967], дзэін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Ленінградскі ін-т інжынераў камунальнага буд-ва (1936). З 1936 да 1938 у Чырв. Арміі. У ліп.— ліст. 1941 камісар батальёна нар. апалчэння (Масква). У партызанах з ліст. 1941. З вер. 1942 камісар *партызанскай брыгады № 18* імя М. В. Фрунзе Баранавіцкай вобл., са жн. 1943 камісар партыз. атрада. Пасля вызвалення Беларусі на сав. рабоце ў Мінску, потым у Бабруйску. Узнаг. ордэнам Айч. вайны 2-й ступені, медалямі.

ВАЎЖЭЦКІ Тамаш Аляксандравіч (1754, Браслаўскі павет — 5.8.1816), удзельнік польскага вызваленчага паўстання 1794, генерал. З шляхты. Дэпутат сейма ад Браслаўскага павета з 1788. На пачатку паўстання дзейнічаў у Браслаўскім пав., пасля ўзначаліў паўстанцаў Курляндыі, быў камандуючым узбр. сіл Жмудзі. Вызначыўся ў штурме Лібавы і ў бітве пад Брэстам. Пасля запалаанення Т. *Касцюшкі* выбраны кіраўніком узбр. сіл Рэчы Паспалітай, абараняў Варшаву, змагаўся з прускімі войскамі. У 1794 трапіў у палон і зняволены ў Пецярбургу да 1796. Напісаў успаміны пра паўстанне ў Вял. кн. Літ. З 1796 жыў на Браслаўшчыне, пасля Айч. вайны 1812 у Царстве Польскім займаў пасады сенатара, ваяводы і міністра юстыцыі.

ВАЎКАВІЧЫ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Раста (2 км). Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 30 км на ПдЗ ад Чавусаў, 35 км ад Магілёва, 18 км ад чыг. ст. Раста, на шашы Магілёў — Слаўгарад. 264 ж., двароў 80 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад, аддз. сувязі, магазін. Брацкая магіла 12 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ВАЎКАВЫСК (летапісны Волковыескъ), горад абл. падпарадкавання, цэнтр Ваўка-



Ваўкавыск. Цэнтральная плошча.

выскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Рось (левы прыток Нёмана). Чыг. вузел. 21,5 тыс. ж. (1969).

У выніку археал. раскопак даказана, што В. узнік у канцы 10 ст. Збераглося стараж. гарадзішча з рэшткамі абарончых збудаванняў 11—13 ст. Матэрыял раскопак сведчыць пра высокі ўзровень развіцця рамяства і ажыўленыя знешнія сувязі. Упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1252. Умацаваны пункт на зах. мяжы Старажытнарускай дзяржавы. Да канца 13 ст. аб'ект барацьбы паміж рус. і літ. князямі. У 1256 кн. ваўкавыскі Глеб удзельнічаў у паходзе на яцвягаў. З пач. 14 ст. канчаткова ў складзе Вял. кн. Літ. У 1386 вял. князь літ. Ягайла ў Ваўкавыскім замку прыняў польскую карону. 16.3.1410 горад захапілі і спалілі тэўтонскія рыцары. Жыхары В. выставілі харугву (полк), якая гераічна змагалася ў Грунвальдскай бітве 1410. З 1500 павятовы цэнтр Навагрудскага ваяводства. У пач. 16 ст. атрымаў магдэбургскае права, якое пацвярджана ў 1595. У руска-польскую вайну 1654—67 заняты рус. войскамі (1655). Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у складзе Расійскай дзяржавы; павятовы горад Слонімскай губ. (жн.—снеж. 1796), Гродзенскай губ. (з 1802). У пач. Айч. вайны 1812 у В. размяшчаўся штаб 2-й Зах. арміі пад камандаваннем П. І. Багратыёна. 17.7.1812 заняты франц. арміяй. 2—3.11.1812 рус. войскі на чале з ген. Сакенам непадалёку ад В. нанеслі паражэнне франц. карпусам Рэнье і Шварцэнберга. У выніку ваен. дзеянняў 1812 спалены. У 1825 у В. было 1685 ж., 193 дамы, суконная ф-ка, на якой працавала 259 рабочых, навуч. ўстанова. Паводле перапісу 1897 — 10 323 ж., з іх 57,6% пісьменных. Развіццю горада спрыяла буд-ва чыгункі праз В. на Беласток (1885). У 1899 было 24 саматужныя прадпрыемствы.

У адказ на рэвалюц. падзеі 1905 у Пецярбурзе 16 студз. забаставалі працоўныя В., адбыліся хваляванні сярод салдатаў. 8—15.12. 1905 баставалі чыгуначнікі. Яны стварылі «Часовы камітэт Баранавіцкага аддзялення Усерасійскага чыгуначнага саюза», які ўзяў пад свой кантроль станцыю і не прапусціў праз В. ніводнага воінскага састава. У 1-ю сусв. вайну акупаваны ням. арміяй, разбураны. У савецка-польскую вайну 1920 паблізу В. (24 жн.—21 вер.) 16-я сав. армія вяла пасіяховыя абарончыя баі супраць польскіх інтэрвентаў. Летам 1920 у В. створаны рэўком, які ўзначальваў камуніст Д. І. Уткес. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 у складзе Зах. Беларусі адышоў да Польшчы; павятовы цэнтр Беластоцкага ваяводства. У В. дзейнічала арг-цыя КПЗБ на чале з гаркомам. У 1924 камуністы вялі барацьбу за школы на бел. мове, за байкот падаткаў; у 1925 стварылі камуніст. ячэйкі ў вайсковых часцях Ваўкавыскага гарнізона. 19.9.1939 вызвалены Чырв. Арміяй. У 1939 у В. было 16 700 ж., 2 пільні, чыгуналіцейны з-д і 2 цагельні, 2 кацельна-слясарныя майстэрні, мясакамбінат і інш. дробныя прадпрыемствы. У Айч. вайну ў акупаваным В. створаны антыфаш. к-т. На тэр. р-на дзейнічалі партызанскія брыгады «Перамога» і імя К. Каліноўскага. 14.7.1944 вызвалены Сав. Арміяй. 2 вайск. злучэннем і 9 часцям, якія ўдзельнічалі ў вызваленні горада, прысвоена ганаровае найменне Ваўкавыскіх. За гады акупацыі гітлераўцы разбурылі В. на 80%.

Прамысловасць: харчовая — маласырзавод, з-д дзіцячых малочных прадуктаў, кансервавы, мясакамбінат, хлебакамбінат; металаапрацоўчая — з-ды ліцейнага абсталявання і метал. вырабаў, філіял мінскага з-да «Эталон» (рамонт дакладных прылад), вагоннае і паравознае дэпо, міжраённая база Сельгастэхнікі; буд. м.— 2 цагельні, кафельны цэх, лесазавод. 5 сярэдніх, 2 школы рабочай моладзі, музычная, 5 дашкольных устаноў, Дом піянераў, дзіцячая спарт. школа, воаветэрынарны тэхнікум, пед. вучылішча, 4 б-кі, 3 кінатэатры, 4 клубы, 2 бальніцы, 2 паліклінікі, 2 дыспансеры, дзіцячы санаторый «Ваўкавыск». *Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей.* У горадзе 2 помнікі сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну, і помнік на брацкай магіле Герояў Сав. Саюза В. Р. *Жолудзева* і В. В. *Еўдакімава*, палк. С. А. Мядзведзева, якія загінулі пры вызваленні горада.

Літ.: Тарасенко В. Р. Раскопки городища «Шведская Гора» в Волковыске в 1954 г., у кн.: Материалы по археологии БССР, т. 1, Мн., 1957; Зверуго Я. Г. Раскопки в Волковыске, у кн.: Археологические открытия 1967 года, М., 1968; Бобровский П. (сост.). Материалы для географии и статистики России... Гродненская губерния, ч. 2, СПб., 1863; Белоруссия, М., 1967 (Советский Союз), с. 207—208; Белорусская ССР. Гродненская область, Мн., 1968, с. 20, 36, 55, 65, 79, 80, 87, 92; Вулгаковский Д. Исторический очерк Волковыска..., Вильна, 1882; Jodkowski I. Grodzisko Wołkowyskie, Grodno, 1925.

Я. Г. Зверуга (археалогія), *С. В. Курач* (гаспадарка). Мінск; *Я. Н. Мараш* (гістар. нарыс). Гродна.

ВАЎКАВЫСКАЕ ЎЗВЫШША, на захадзе БССР, у Гродзенскай вобл. Паўд.-Зах. частка Беларускай грады, паміж р. Свіслаччу і Зальвянкай (левыя прытокі Нёмана). Рэльеф хваліста-платопадобны з астаткавымі марэннымі градамі (да 242 *м* над узр. м.), камавымі ўзгоркамі і дзюнна-ўзгорыстымі формамі. Сярэднюю частку В. ў. праразае даліна р. Рось. Глебы дзярнова-падзолістыя, супясчаныя, радзей сугліністыя. Лясістасць каля 10%. Пераважаюць хваёвыя масівы, радзей бярэзнікі з прымессю вольхі. На сугліністых грунтах — шыракалістыя пароды, асабліва дуб, ліпа і інш. Пад ворывам каля 50%. Радовішчы мергельна-мелавых парод і глінаў выкарыстоўваюцца для вытворчасці цэменту.

ВАЎКАВЫСКІ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ імя П. І. Багратыёна (назва з лют. 1953), узнік у 1935 на грамадскіх асновах як краязнаўчы музей, з вер. 1939 Дзярж. музей. У Вял. Айч. вайну разрабаваны ням.-фаш. захопнікамі. У 1948 адноўлены. З 1949



Будынак Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя П. І. Багратыёна.


у будынку, у якім у 1812 знаходзілася штаб-кватэра 2-й Зах. арміі пад камандаваннем П. І. *Багратыёна.*


У 6 залах і фондах музея (пл. 262 *м*²) каля 65 тыс. экспанатаў. 5 аддзелаў: стараж.-рускі Ваўкавыск, нашы вялікія продкі, Айч. вайна 1812, гісторыя сав. грамадства (1917—41), Вял. Айч. вайна 1941—45. Экспануюцца матэрыялы, знойдзеныя ў час археал. раскопак стараж. Ваўкавыска (вырабы 11—13 ст. з косці, металу, шкла; кераміка, упрыгожанні), трафейная зброя (рыцарскія даспехі 17 ст., польскія шлемы, турэцкія пісталеты); зброя і адзенне рус. воінаў 18—19 ст. (літаўра і бронзавая гармата 1778), рус. сцягі часоў суворaўскіх паходаў. У раздзеле Айч. вайны 1812 — дакументы, карты, зброя, сцягі, памятныя медалі ў гонар перамог над французамі; партрэты герояў бітваў пад Астроўнай, Міром, Клясціцамі, Салтанаўкай, Барадзіном. Многа экспанатаў пра жыццё і дзейнасць Багратыёна (фотакопіі дакументаў, напісаных ім у Ваўкавыску, карціны мастакоў, макеты і фотаздымкі дома, дзе ён праводзіўся, і інш.). Шырока адлюстравана Вял. Айч. вайна, у т. л. дзейнасць падпольных Ваўкавыскіх райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, антыфаш. к-та, партыз. брыгад і атрадаў, паказаны звярствы акупантаў. У вітрынах матэрыялы пра Герояў Сав. Саюза, якія загінулі пры вызваленні Ваўкавыска — В. Р. *Жолудзева*, В. В. *Еўдакімава*. У зале «Ваўкавыскі раён за гады Сав. улады» — табліцы і дыяграмы развіцця прамысл. і с. гасп. Спец. стэнд прысвечаны землякам — Героям Сац. Працы (Р. І. *Шавякоў* і В. І. *Пятручык*), перадавікам прамысловасці і с. гасп. У 1969 музей наведала каля 30 тыс. чал. Г. В. *Іўчык*. Ваўкавыск.

ВАЎКАВЫСКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на ПдЗ вобл., на абодвух баках р. Рось. Пл. 1,1 тыс. *км*². Нас. 67,5 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 10 сельсаветаў; гар. пасёлкі Рось і Краснасельскі. Цэнтр г. Ваўкавыск.

Тэр. раёна занята *Ваўкавыскім узвышшам.* Карысныя выкапні: 10 радовішчаў цэментнай сыравіны (у т. л. 4 мелу) — 208,9 млн. *т* (Калядзічы і Калядзічы 2-я — 152,4 млн. *т*, Роскае — 23,5 млн. *т*); 6 радовішчаў гліп — 37,1 млн. *т* (Данілаўскае 1-е і 2-е — 24,0 млн. *т*, Шандры — 11,6 млн. *т*); 6 радовішчаў цагельных гліп — 1,7 млн. *м*³ (Альшымава — 0,5 млн. *м*³, Ваўкавыскае — 0,3 млн. *м*³); радовішча мелу для ванны (Рось 1-я — 0,2 млн. *т*), 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 11,1 млн. *м*³ (у т. л. Янова 9,8 млн. *м*³). Сярэдняя т-ра студз. ад —5 да —5,5 °С, ліп. 18—18,5 °С. Ападкаў 530 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Рэкі: Рось (бас. Нёмана) з прытокамі Ваўпянка і Нятупа, па З — Верацейка, прыток Свіслачы (бас. Нёмана). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (77,3%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (7,5), дзярнова-балотныя (10,7), тарфяна-балотныя (3%) і інш. З мінер. глебаў 50,6% суглінкавых, 46,1 супясчаных, 3,3% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 43 (цана бала 0,27 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 26, усіх с.-г. угоддзяў — 40. Пад лесам 23% тэр. Пераважае хвоя, з лісцевых бяроза, вольха. Насяляюць раён беларусы, палякі, рускія, яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 61 чал. на 1 *км*², у т. л. сельскага 29 чал. на 1 *км*². Гарадскога 52%; 31% насельніцтва жыве ў Ваўкавыску.

Прамысл. буд. м.— *Ваўкавыскі цэментны завод* «Перамога»; камбінат буд. м.: з-д сілікатнай цэглы ў Росі (шыфер, сілікатныя блокі, цэгла, вапна), 2 цагельні (Ваўкавыск, Станкаўцы), кафельны цэх, лесазавод; цагельня (Ваўкавыск); палігон жалезабетонных вырабаў (Краснасельскі). Харч. прамысл.: 2 масласырзаводы (Ваўкавыск, Рось), з-д дзіцячых малочных прадуктаў, кансервавы з-д, мясакамбінат, хлебакамбінат (Ваўкавыск), 3 спірт. з-ды (Падароск, Ендрыхаўцы, Злобаўшчына), вінзавод у Кузьмічах, камбікормавы з-д у Росі. Металаапр. прамысл.: з-ды ліцейнага абсталявання і метал. вырабаў, філіял мінскага з-да «Эталон» (Ваўкавыск); Ваўкавыскае і Падароскае раённыя аб'яднанні Сельгастэхнікі, вагоннае і паравознае дэпо, міжраённая база Сельгастэхнікі. Камбінат быт. абслугоўвання. Міжкалгасбуд, апорна-паказальны лясгас, дзяржплемстанцыя, птушкафабрыка і інш. У раёне 15 калга-





Свінаферма ў саўгасе «Шылавічы».

саў, 9 саўгасаў (1970), вуч. гаспадарка зоаветэрынарнага тэхнікума.

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» *(Мачульна)*, імя XXII парта'езду *(Дуляўцы)*, «Дружба» *(Рупейкі)*, імя Жданава *(Ізабеліна)*, «За Радзіму» *(Канюхі)*, імя Заслонава *(Хацькоўцы)*, «Звязда» *(Няверавічы)*, «Змагар» *(Грыбаўцы)*, імя Леніна *(Рэпля)*, «Савецкая Беларусь» *(Плябанаўцы)*, імя Свярдлова *(Малая Лапеніца)*, імя Суворава *(Дзятлавічы)*, «Ударнік» *(Сядзельнікі)*, «Уперад» *(Нізяны)*, «Чырвоны Кастрычнік» *(Мацвеевічы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Ваўкавыскі» *(Вярэйкі)*, «Воўпа» *(Воўпа)*, «Гнезна» *(Гнезна)*, «Зара» *(Субачы)*, «Падароск» *(Падароск)*, «Рось» *(Рось)*, «Талькаўцы» *(Радзікі)*, «Чырвонагрудскі» *(Чырвоны Груд)*, «Шылавічы» *(Шылавічы)*. Вуч. гасп. зоаветэрынарнага тэхнікума «Войткавічы» *(Войткавічы)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 65% тэр. Агульная пасяўная пл. ў 1969 (тыс. *га*) 59,1, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі (азімае жыта, ячмень, пшаніца, кармавы лубін на зерне) 28,8, бульбай 7,3, кармавымі 20,7, тэхнічнымі 2. На пач. 1970 было (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 40,1 (у т. л. кароў 19,2), свіней 38,2, авечак 4,7. Гал. віды транспарту: чыгуначны і аўтамабільны. Чыгунка Баранавічы — Слонім — Ваўкавыск — Масты. Шашэйныя дарогі: Баранавічы — Слонім — Ваўкавыск — Гродна, Ваўкавыск — Шчучын, Ваўкавыск — Ружаны і інш.


На пач. 1970 у раёне (з Ваўкавыскам) было 17 сярэдніх, 17 васьмігадовых, школа-інтэрнат, 49 пачатковых, 4 школы рабочай моладзі; 14 дашкольных устаноў, пед. вучылішча і зоаветэрынарны тэхнікум, 25 масавых б-к, 31 клубная ўстанова, 35 кінаўстановак, у т. л.

Дом адпачынку «Рось».



25 стацыянарных; 9 бальніц, 2 дыспансеры, 20 фельч.-ак. пунктаў. 2 санаторыі — «Ваўкавыск» і «Краскі», дом адпачынку «Рось». У 1970 у раёне працаваў 921 спецыяліст з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 125 інжынераў, 39 аграномаў, 28 заатэхнікаў, 19 вет. урачоў, 38 эканамістаў, 19 тавараведаў, 77 урачоў, 544 настаўнікі і інш.; 2020 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Газ. «Знамя Октября» (раённая і гарадская). *С. В. Курач.* Мінск.

ВАЎКАВЫСКІ ЦЭМЕНТНЫ ЗАВОД «Перамога» (у г. п. Краснасельскі Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.), прадпрыемства прамысловасці буд. матэрыялаў. Выпускае цэмент, які хутка цвярдзее, і портландцэмент марак 400, 500, 600. Пачатак буд-ва 1913 (акцыянернае т-ва «Валынь»). У 1914 здадзены ў эксплуатацыю 2 тэхнал. лініі, пячное аддзяленне з 2 вярчальнымі печамі, разлічанымі на вытворчасць 180 *т* клінкеру за суткі. Для абпальвання яго выкарыстоўваўся сілезскі вугаль. Пасля вызвалення Зах. Беларусі пачалося тэхн. пераабсталяванне з-да. 3-я лінія ўведзена ў дзеянне ў 1947, у 1959—61 — яшчэ 2 тэхнал. лініі агульнай магутнасцю 300 тыс. *т* цэменту за год. З 1962 завод поўнасцю комплексна механізаваны. На паліва выкарыстоўваецца газ. У 1964 заводу нададзена званне Прадпрыемства камуніст. працы. У 1969 выпушчана 667,8 тыс. *т* цэменту — амаль у 4,5 раза больш, чым у 1940. Пры з-дзе клуб, дзіцячыя дашкольныя ўстановы. *В. І. Шайчук.* г. п. Краснасельскі.



Агульны выгляд завода.

ВАЎКАЛАК (вурдалак; ад стараслав. влък — воўк, длакъ — поўсць), персанаж славянскай міфалогіі, пярэварацень, які нібыта

мог перакінуцца ў воўка. Паўднёваславянскія вераванні звязваюць В. з *вампірам*. Мяркуюць, што гэта водгук старадаўняга татэмістычнага «свята ваўка», якое існавала ў некат. плямёнаў зах. славян. Падобныя вераванні вядомы ў Індыі, дзе замест воўка выступае тыгр, у Афрыцы — леў ці гіена, у Паўд. Амерыцы — ягуар.

ВАЎКАЛАТКА, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Гастэлы. За 55 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 168 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Будслаў. 202 ж., двароў 58 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 45 сав. воінам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВАЎКІ, вёска ў Ласіцкім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны сцяг». За 42 *км* на ПдУ ад Паставаў, 224 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Навадруцк, на шашы Віцебск — Вільнюс. 192 ж., двароў 65 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ВАЎКОЎШЧЫНА, вёска ў Ёдскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Камсамолец». За 16 *км* на ПнЗ ад Шаркоўшчыны, 213 *км* ад Віцебска. 58 ж., двароў 18 (1970). Клуб, б-ка, млын.

ВАЎНАЕД АВЕЧЫ, бяскрылая муха сямейства крывасосак; тое самае, што і *Рунец авечы*.

ВАЎНЯНКА (Lactarius torminosus), шапкавы ядомы грыб сям. сыраежкавых. Шапка ружова-чырванаватая, 4—12 *см* у дыяметры, слаба слізістая, з ямкай у цэнтры і падагнутым пушыстым краем. Мякаць крэмавая. Млечны сок белы, едкі. Пласцінкі ружаватыя. Ножка роўная, цыліндрычная, белавата-ружовая. В. расце ў мяшаных лясах на вільготных мясцінах у ліпені — кастрычніку. Спажываецца соленая і марынаваная. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Грыбы*.

ВАЎНЯНКІ (Lymantriidae), сям. начных матылёў. Маюць густа апушанае цела, недаразвіты хабаток, перыстыя вусікі (у самцоў). Вусені з пучкамі валаскоў на кожным членіку. Кукалка валасістая ў рэдкім шаўкавістым кокане. Жыве на раслінах або сярод раслінных рэшткаў на глебе. Вядома каля 4000 відаў, пашыраных пераважна ў вільготных трапічных лясах Старога Свету. Некаторыя В. шкоднікі садоў і лесу (няпарны шаўкапрад, залатагузка, кісцяхвост звычайны і інш.).

ВАЎПШАСАЎ Станіслаў Аляксеевіч [н. 15(27).7.1899, мяст. Груздзе Шавельскага пав. Ковенскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў грамадз. і Вял. Айч. войны. Герой Сав. Саюза (1944). З сям'і парабка. Чл. КПСС з 1940. З 1915 рабочы на прадпрыемствах Масквы, Запарожжа. У 1918 добраахвотна пайшоў у Чырв. Армію. Удзельнік баёў на Зах. фронце. Скончыў у Смаленску паліткурсы Зах. фронту (1919). У 1920—25 кіраваў партыз. атрадамі ў Зах. Беларусі. З 1925 на адм.-гасп. пасадах у Маскве, з 1930 у НКУС. Удзельнік антыфаш. барацьбы ў Іспаніі (1937—39), сав.-фін. вайны 1939—40. З вер. 1941 узначальваў батальён мотастралковай брыгады спец. прызначэння, якая абараняла Маскву. З 5.3.1942 у тыле ворага: нач. аператыўнай групы, камандзір партыз. атрада спец. прызначэння, чл. Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б. На тэр. Мінскай вобл. арганізоўваў партыз. атрады, падпольныя групы. У час вайны з Японіяй (1945) у Маньчжурыі ўзначальваў аператыўную групу. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.



Тв.: Партизанская хроника, М., 1961; На разгневанай зямлі, Мн., 1963.

ВАЎПЯНКА, рака, левы прыток Росі (бас. Нёмана). Даўж. 31 *км*. Пачынаецца на паўн.-зах. схілах Ваўкавыскага ўзвышша, цячэ па Нёманскай нізіне ў Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл. Вадазбор (165 км²) — раўніна, складзеная з донна-марэнных адкладаў, ёсць суфазійныя западзіны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,8 *м³/сек*.

ВАЎЧА́НКА, рака, правы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 31 *км*. Цячэ па Цэнтральнабярэзінскай раўніне ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл. Пл. вадазбору 374 км². Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,9 *м³/сек*.

ВАЎЧА́НКА, хваробы, пры якіх на скуры паяўляюцца язвы і рубцы, як ад укусу воўка. Адрозніваюць В.: вульгарную — туберкулёзную (ваўчаначны туберкулёз скуры, воўчы лішай, раз'ядальны лішай); чырвоную (эрытэматоз) з невядомым узбуджальнікам; сістэмную чырвоную — цяжкую хваробу (гл. *Калагенозы*). Пры вульгарнай В. на скуру твару, слізістай абалонцы рота і носа, на кісцях рук, на нагах паяўляюцца чырванаватыя плямы, якія ператвараюцца ў бугаркі і марудна загойваюцца. Лячэнне і прафілактыка як пры туберкулёзе. Чырвоная В. (дыскоідная форма) пачынаецца як вульгарная, а заканчваецца рубцовай атрафіяй скуры на шчоках і пераноссі. Лячэнне: процімалярыйныя сродкі, кортыкастэроіды.

Літ.: Красная волчанка, Мн., 1967; Машкиллейсон Л. Н. Инфекционные и паразитарные болезни кожи, М., 1960 (бібліягр.).

А. Ц. Сасноўскі. Мінск.

ВАЎЧАЯГАДА (Daphne), род кусцікавых раслін сям. ваўчаягадавых. Лісце цэласнае, прадаўгавата-ланцэтнае, кароткачаранковае.

Ваўчаягада звычайная.



Кветкі двухполыя, руковыя, духмяныя, адзіночныя або сабраныя пучкамі ў пазухах лісця. Плод — мясістая чырвоная касцянка. Вядома больш за 100 відаў, пашыраных у Еўропе. У СССР 18, у БССР 2: В. звычайная, воўчае лыка (D. mezereum) і В. баравік (D. cneorum). Найб. вядомая В. звычайная (нар. назвы: ваўчынец, жыламяць, воўчыя ягады). Вельмі ядавітая расліна, асабліва яе кара і ягады. Расце ў лясах, вырошчваецца як дэкаратыўная.

ВАЎЧКІ (Bidens), род аднагадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Выш. 10—100 *см*. Лісце цэласнае, пілавата-зубчастае або трохраздзельнае, з буйной канцавой лопасцю. Кветкі жоўтыя ці брудна-жоўтыя, у прамастойных кошыках. Вядома каля 130 відаў, пашыраных амаль на ўсім зямным шары. У СССР 8, у БССР 3 віды. Найб. вядомыя — В. трохраздзельныя (B. tripartitus, нар. назвы: чарада, сабачкі, лапатнік). Растуць па берагах рэк, азёр, каля канаў. Расліна мае эфірны алей, дубільныя рэчывы, караціін, аскарбінавую к-ту. У медыцыне выкарыстоўваюцца лісце і кветаносныя верхавінкі В.

ВАЎЧОК Алесь (г. н. і см. невяд.), беларускі народны казачнік. Селянін з в. Крылоўшчына Навагрудскага пав. У 1901 польскі лінгвіст Э. Кліх запісаў ад яго 18 казак і апавяданняў, якія надрукаваў (урыўкі), дакладна перадаўшы асаблівасці мясцовага дыялекту. У традыц. бытавых казачных сюжэтах В. самабытна развіваў сац. матывы, жыва перадаваў жанравыя сцэнкі.

Публ.: Klich E. Teksty białoruskie z powiatu Nowogródzkiego, у кн.: Materiały i prace Komisji językowej Akademii Umiejętności, t. 2, Kraków, 1903.

ВАЎЧОК Марка [сапр. Вілінская-Марковіч Марыя Аляксандраўна; 10(22).12.1834, в. Екацярынаўка Ялецкага пав. Арлоўскай губ. — 28.7(10.8).1907], украінская і руская пісьменніца. З дваран. Вучылася ў Харкаўскім пансіёне (1845—48), працавала ў Арле. У 1851 выйшла замуж за А. В. Марковіча (укр. фалькларыст) і пераехала на Украіну. У Пецярбурзе пазнаёмілася з Т. Шаўчэнкам, М. Някрасавым, І. Тургеневым. З 1859 за мяжой (Францыя, Германія, Італія, Швейцарыя), дзе сустракалася з А. Герцэнам, М. Дабралюбавым, Л. Талстым, Ж. Вернам, Г. Флаберам. Зімою 1867 вярнулася ў Пецярбург, выдавала (1871—72) час. «Переводы лучших иностранных писателей». З 1878 жыла на Паўн. Каўказе і Украіне. Памерла і пахавана ў Нальчыку. Пісала на ўкр., рус. і франц. мовах. Першыя зб. «Народныя апавяданні» (1857) і «Апавяданні з народнага рускага побыту» (1859) высока ацанілі Т. Шаўчэнка, М. Дабралюбаў, Дз. Пісараў. Апавяданні В.— рэаліст.



карціны цяжкага жыцця сялян, асабліва жанчын, да рэформы 1861. У іх адлюстраваны пакуты простага народу і яго імкненне да свабоды. Да «Народных апавяданняў» ідэйна і тэматычна блізкія аповесці «Тры долі» (1861), «Маруся» (1871) і інш. Аповесці-казкі «Дзевяць братоў і дзесятая сястрыца Галя» (1863), «Кармалюк» (1865) — на фалькл. сюжэты. У 60—70-я г. напісала некалькі аповесцей і раманаў на рус. мове, у іх выкрыла гніласць дзярж. ладу царскай Расіі, высмеяла прадажнае чыноўніцтва, інтэлігентаў-філантропаў, бурж. лібералаў («Глухі гарадок», 1862; «Живая душа», 1868; «Запіскі дзячка», 1869—70; «Цёплае гняздзечка», 1873; «У глушы», 1875). Пераклала на рус. мову 15 раманаў Ж. Верна, творы Х. Андэрсена, Б. Пруса, А. Брэма, Ч. Дарвіна. Збірала ўкр. і рус. фальклор.

Тв.: Твори, т. 1—7, Київ, 1964—67; Собр. соч., т. 1—3, М., 1957.

Літ.: Засенко О. Е. Марко Вовчок, Київ, 1964; Яго ж. Марко Вовчок і зарубіжні літератури, Київ, 1959. *В. А. Чабаненка.* Запарожжа.

ВАФІЯДЗІ Уладзімір Гаўрылавіч [н. 28.12.1910(10.1.1911), Масква], беларускі савецкі фізік. Чл.-кар. АН БССР (1966), д-р фіз.-матэм. н. (1963), праф. БДУ (1964). У 1931—62 працаваў у Дзярж. аптычным ін-це (Ленінград). З 1962 у Мінску, заг. кафедры электрафізікі БДУ. Асн. кірункі навук. дзейнасці: распрацоўка оптыка-электронных прылад, інфрачырвоная тэхніка, спектраскапія, фізіка атмасферы, мадуляцыя святла і радыяцыйныя вымярэнні тэмпературы. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.



Тв.: (Разам з А. А. Лебедзевым і В. В. Балаковым) Световой дальномер для геодезических измерений, «Доклады АН СССР», 1956, т. 108, № 3; Очерк истории открытия конечности скорости света, у кн.: Труды, посвященные 70-летию со дня рождения академика А. А. Лебедева, М.— Л., 1966 (Труды Государственного оптического ин-та, т. 33, в. 162); Фотоэлектрическая автоматика, Мн., 1966.

ВАХАБІТЫ, паслядоўнікі вахабізму — рэлігійна-паліт. плыні ў ісламе, што ўзнікла ў 18 ст. ў Цэнтр. Аравіі.

Заснавальнік вахабізму Мухамед ібн Абд-аль-Вахаб заклікаў выгнаць туркаў з араб. краін, аб'яднаць Аравію. В. выступалі супраць афіц. «турэцкага» ісламу, які прадугледжваў шанаванне Мухамеда і культ святых, адмаўляліі племянныя культы. Ідэі В. спрыялі аб'яднанню (канец 18 ст.) дробных княстваў Аравіі ў адзіную дзяржаву, якая да пач. 19 ст. пашырылася амаль на ўвесь Аравійскі п-аў. У 1811—18 дзяржаву В. перамаглі егіп. войскі. Аднаўлялася в 1821 да апошняй чвэрці 19 ст., потым, пасля часовага аднаўлення княствам Шамар, у пач. 20 ст. У выніку аб'яднальных войнаў (20-я г. 19 ст.) тэр. дзяржавы В. павялічылася. У 1932 атрымала назву Саудаўская Аравія, дзе вахабізм — афіц. ідэалогія.

Літ.: Васильев А. М. Пуритане ислама?, М., 1967.

ВАХНЕНКА Аляксей Якаўлевіч (28.11.1920, в. Лысая Гара Валнавахскага пав. Харкаўскай

губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся ў чэрв. 1944 у баях за Магілёў. Пад агнём ворага фарсіраваў са сваёй ротай Дняпро, замацаваўся на захопленай вышыні і адбіваў варожыя контратакі, гэтым садзейнічаў фарсіраванню ракі інш. падраздзяленнямі сав. войск. Жыве ў пас. Чутава Палтаўскай вобл. УССР.

ВАХОНІН Рыгор Іванавіч (н. 25.5.1919, с. Янава Барнаульскага пав. Томскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1946. На фронце са снеж. 1941. Вызначыўся 29.9.1943 каля Лоева Гомельскай вобл. З аддзяленнем разведчыкаў фарсіраваў Дняпро, прабраўся ў тыл ворага, знішчыў яго агнявыя кропкі і гэтым забяспечыў пераправу ўсёй роты без страт. Жыве ў Сяміпалацінску Каз. ССР.

ВАХОЎСКАЯ Варвара Іванаўна (1855, Херсонская губ.— 1929), рэвалюцыянерка-народніца, жонка А. В. *Бонч-Асмалоўскага*. У 1872 паехала вучыцца ў Цюрых, удзельнічала ў гуртку М. А. *Бакуніна*. У 1875 вярнулася ў Расію, арыштавана і пасля 3 гадоў турмы па *працэсе 193-х* саслана ў Падольскую губ. Была звязана з вядомымі дзеячамі *«Народнай волі»* С. Ф. *Кавалікам*, С. Л. *Пяроўскай*, В. М. *Фігнер* і інш. У 1880 пераехала ў маёнтак мужа Блонь Ігуменскага пав. Мінскай губ., узята над нагляд паліцыі, але рэвалюц. дзейнасці не спыніла. Зноў арыштавана ў 1882 у Адэсе пры выкананні даручэння Фігнер. У рэвалюцыю 1905—07 вяла рэвалюц. агітацыю сярод сялян Мінскай губ., памагала мужу і сынам стварыць у в. Блонь філіял Усерасійскага сялянскага саюза, за што разам з імі прыцягнута да судовай адказнасці. Аўтар «Успамінаў рэвалюцыянеркі» («Полымя», 1925, № 2).

ВАХТАНГАЎ Яўген Багратыёнавіч [1(13).2.1883, Уладзікаўказ — 29.5.1922], рускі савецкі рэжысёр, акцёр, тэатральны дзеяч. У 1911 прыняты ў Маск. маст. т-р. З арганізацыяй 1-й студыі МХТ (1912) яе акцёр і рэжысёр, вёў заняткі па сістэме К. Станіслаўскага. Акцёр дакладнай і строгай сцэнічнай формы, псіхал. глыбіні. У першых самастойных пастаноўках на маральна-этычныя тэмы («Свята міру» Г. Гаўптмана, 1913; «Патоп» Ю. Бергера, 1915) падкрэсліваў іх сатыр., выкрывальнае гучанне. З 1913 кіраваў Студэнцкай драм. студыяй (з 1920 3-я Студыя МХТ, з 1926 *Тэатр імя Вахтангава*). Пасля рэвалюцыі актыўна выступаў за стварэнне сав. т-ра. Спектаклі В. вызначаліся сац. завостранасцю і тэатр. выразнасцю: «Вяселле» А. Чэхава (1920) і «Цуд святога Антонія» М. Метэрлінка (1921, 2-я рэдакцыя, 3-я Студыя МХТ), «Эрык XIV» А. Стрындберга (1921, 1-я Студыя МХТ) і інш. У «Прынцэсе Турандот» К. Гоцы (1922) знайшоў новую сучасную форму спектакля ў іранічных адносінах акцёраў да сюжэту казкі, у яркім, святочным імправізаваным паказе.



Літ.: Евг. Вахтангов. Материалы и ст., М., 1959.

ВАЦЭЦІС Іаакім Іаакімавіч [11(23).11.1873, Курляндская губ.— 28.7.1938], савецкі ваенны дзеяч, першы галоўнакамандуючы Узброеных Сіл Савецкай Рэспублікі. Камандарм 2-га рангу. З парабкоў. На ваен. службе з 1891. Скончыў Акадэмію Ген. штаба (1909). У 1-ю сусветную вайну палкоўнік царскай арміі. У дні Кастр. рэвалюцыі перайшоў на бок Сав. улады, уступіў у Чырв. гвардыю, камандаваў 2-й латышскай брыгадай. Са снеж. 1917 нач. Рэвалюц. палявога штаба Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве. З 28.1.1918 галоўнакамандуючы сав. войск, якія ўдзельнічалі ў барацьбе супраць польскага корпуса генерала Даўбор-Мусніцкага. З 13.4.1918 нач. Латышскай стралк. сав. дывізіі. 6—7.7.1918 кіраўнік аперацыі па ліквідацыі леваэсэраўскага мяцяжу ў Маскве. З 12.7.1918 галоўнакамандуючы Усх. фронту. 6.9.1918—8.7.1919 галоўнакамандуючы Узбр. Сіл РСФСР. З жн. 1919 да 1921 у Рэўваенсавеце Рэспублікі. З 1922 праф. Ваен. акадэміі імя Фрунзе. Аўтар ваен.-навук. прац: «Пра ваенную дактрыну будучыні» (1923), «Баявыя дзеянні ва Усходняй Прусіі ў ліпені, жніўні і ў пачатку верасня 1914 г. Стратэгічны нарыс» (1923) і інш. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.

Літ.: Спреслис А. И. Латышские стрелки на страже завоеваний Октября. 1917—1918, Рига, 1967.

ВАЦЯКОЎ Веньямін Іосіфавіч (н. 1.8.1921, Бугуруслан Самарскай губ.), беларускі савецкі вірусолаг. Д-р мед. н., праф. (1966). Чл. КПСС з 1948. Дырэктар Бел. НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі (з 1950). Асн. працы па комплексным вывучэнні кляшчовага энцэфаліту, ліквідацыі поліяміэліту, удасканаленні прафілактычных прэпаратаў супраць воспы, таленства і туберкулёзу. Пад кіраўніцтвам В. распрацавана тэхналогія і наладжаны выраб першых айч. пажыўных асяроддзяў для культуры клетак. Узнаг. 3 ордэнамі.

Тв.: У кн. — Клещевой энцефалит, Мн., 1965; у кн.: Иммунологические исследования в диагностике и профилактике инфекц. заболеваний, Мн., 1968.


ВАЧЭЙ ХВАРОБЫ, прыроджаныя ці набытыя хваробы вока і яго прыдаткаў (павек, слізістай абалонкі, слёзных органаў, арбіты). Маюць стацыянарны характар, з узмацненнем або з рэцыдывамі; пашкоджваюць адзін ці абодва вочныя яблыкі. Узнікаюць ад мясцовых прычын (траўмаў, інфекцыйных працэсаў, пухлін і інш.), парушэння нераламляльнай магчымасці вока (рэфракцыі), часцей ад агульных хвароб арганізма (токса-

плазмоз, туберкулёз, бруцэлёз, бактэрыяльныя і вірусныя інфекцыі, хваробы нервовай, сардэчна-сасудзістай, эндакрыннай сістэм, нырак, крыві, зубоў, міндалін і інш.). Пашыраныя В. х.— запаленні (*ячмень, кан'юнктывіт*, кератыт). У большасці выпадкаў яны вылечваюцца без парушэнняў зрокавых функцый, акрамя кератытаў і кан'юнктывітаў ад дыфтэрыі, ганарэі і вірусных інфекцый (у некат. выпадках астаецца бялъмо). *Катаракта* выклікае страту зроку і інваліднасць, бывае прыроджаная і набытая, развіваецца ў дзяцей і ў дарослых. *Глаўкому* ва ўсім свеце лічаць першай прычынай слепаты. Хваробы сятчаткі (дэгенерацыя, адслойка, запаленне і інш.), зрокавага нерва (застойны сасок, неўрыт, атрафія), сасудзістага тракту (увеіт і інш.) узнікаюць ад хвароб цэнтр. нервовай, сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм. Траўмы вока і яго прыдаткаў бываюць на вытворчасці, у быце (асабліва ў дзяцей), у ваенны час. Падзяляюцца на лёгкія (павярхневыя) і цяжкія (прарыўныя, часта з унутрывочным укараненнем іншародных целаў, з апёкамі і кантузіямі). Поспехі навукі і тэхнікі расшырылі магчымасць лячэння В. х. З дапамогай лазера лечаць некат. віды адслаення сятчаткі і пухлін; выкарыстанне звышнізкіх т-р (да —80 °С) дало магчымасць раней выдаляць катаракты; з'явіліся «нябачныя акуляры» — кантактавыя лінзы і інш. Дзякуючы карэннай змене сац.-бытавых умоў, павышэнню культ. і матэрыяльнага ўзроўню насельніцтва, паляпшэнню якасці лячэбна-прафілакт. дапамогі на Беларусі зніштожаны В. х. ад ганарэі, сіфілісу, воспы, малярыі. Найбольш важнае дасягненне — ліквідацыя *трахомы*, якая да Кастр. рэв. мела вялікую ўдзельную вагу сярод В. х. Паспяхова распрацоўваюцца ў БССР пытанні ранняга хірург. лячэння розных відаў катарактаў, хірург. дапамогі пры траўмах, глаўкоме, туберкулёзе вачэй, удасканалены аперацыі перасадкі рагавіцы і інш.

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969; Золотарева М. М. Глазные болезни, 2 изд., Мн., 1964; Глазные болезни, у кн.: Материалы научно-практической конференции (30—31 окт. 1967), Мн., 1969; Брич Т. В. Оксигенотерапия при некоторых заболеваниях глаз, «Сборник научных трудов Минского государственного медицинского ин-та», 1957, т. 20.

М. М. Залатарова. Мінск.

ВАШКЕВІЧ Аляксандр Аляксандравіч [15(28).8.1901, в. Белавеж Пружанскага пав. Гродзенскай губ.— 26.4.1945], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1920. У Чырв. Арміі з вер. 1919. Удзельнік грамадз. вайны. У Айч. вайну камандаваў палком. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра. У ноч на 27.9.1943 умела арганізаваў пераправу палка каля в. Перавалочная Кішэньковічы Чарнобыльскага р-на Палтаўскай вобл. Без страт у жывой сіле і тэхніцы полк замацаваўся на плацдарме і паспяхова наступаў па З. Загінуў у баі пад Берлінам. Пахаваны ў Варшаве.



ВАШКЕВІЧ Васіль Васілевіч [н. 19.4(1.5).1892, Мінск], удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З рабочых. Чл. КПСС з мая 1917. Вёў бальшавіцкую агітацыю сярод салдатаў Мінскага гарнізона і прыфрантавой палосы. У сак. 1917 — лют. 1918 чл. Мінскага Савета, камісар гарадской гаспадаркі. У лютым 1918 камендант абароны чыг. ст. Орша. З сак. да канца 1918 камісар гарадской гасп. Смаленска, заг. аддзела фінансаў Абласнога выканаўчага к-та Зах. вобл. і фронту (Аблвыкамзаха). У 1919—21 старшыня Смаленскага гар. выкакома. З 1922 на парт. рабоце: сакратар Рослаўскага павятовага, заг. аддзела Смаленскага губ. к-таў РКП(б), сакратар Севастопальскага гарадскога, заг. аддзела Крымскага абл. к-таў, старшыня Брапскай акр. кантрольнай камісіі ВКП(б), нам. наркома РСІ Тат. АССР, чл. парткалегіі Камісіі парт. кантролю пры ЦК ВКП(б) па Тат. АССР. З 1945 старшыня Маладзечанскай абл. калегіі адвакатаў, заг. аддзела Маладзечанскага гаркома КПБ. Узнаг. ордэнам Леніна. Жыве ў Смаленску.




ВАШКЕВІЧ Уладзімір Раманавіч [н. 17(30).3.1900, мяст. Зембін Барысаўскага пав.], савецкі ваенны дзеяч, ген.-палк. (1954). З сялян. Чл. КПСС з 1919. З 1918 чырвонаармеец Магілёўскай дывізіі ў Оршы. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1928). У Айч. вайну на Зах., Калінінскім і 3-м Прыбалт. франтах: камандзір дывізіі, нач. штаба арміі, нач. штаба 3-га Прыбалт. фронту. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Эстоніі, Латвіі. У 1945—54 нач. штаба Прыбалт. і Закаўказскай ваен. акруг, у 1955—56 нач. кафедры Ваен. акадэміі Ген. штаба, у 1956—61 на навук. рабоце. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.



ВАШЧАНКІ, беларускія друкары і гравёры канца 17 — першай трэці 18 ст., прадстаўнікі магілёўскай школы.

Максім Ярмаліяіч (2-я пал. 17 ст.— 1708), гравёр па медзі. Друкарская дзейнасць звязана з Слуцкам, потым з Магілёўскім богаяўленскім брацтвам, дзе ён працаваў у друкарні (кіраваў ёю з 1680 да 1708). Творы: 16 гравюр для кн. «Манархія турэцкая, апісаная Рыко» (Слуцк, 1678); 23 гравюры (1680) для кн. «Акафісты і каноны» (Магілёў, 1693). Асабліва цікавыя прадмовы да шэрагу кніг, у якіх ён раскрывае свае погляды асветніка і гуманіста.



М. Я. Вашчанка. Вялікі вазір. Фрагмент гравюры з кн. «Манархія турэцкая, апісаная Рыко». Слуцк. 1678 (злева). В. М. Вашчанка. Загалоўны ліст з кн. «Дыоптра». Магілёў. 1698.

Васіль Максімавіч (г. н. і см. невяд.), гравёр па дрэве. Сын М. Я. Вашчанкі. Працаваў у 1694—1730 у друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва. Вядомы 7 падпісаных і 15 непадпісаных гравюр, якія вызначаюцца абагульненай і пластычнай трактоўкай формаў. Сярод работ: антымінсы (арыгінальныя ўзоры станковай гравюры на дрэве, надрукаваныя на палатне) 1694, 1708 («Палажэнне ў труну Хрыста») і 1723; загалоўныя лісты ў кнігах «Дыоптра» (1698), «Неба новае», «Перла многацэннае» (абодва 1699), «Кніга жыцій святых» (1702, загаловачны ліст з відам Масквы); лісты «Нараджэнне Хрыста»; пабудаваныя на рэзкіх кантрастах святла і цяню «Іаан Дамаскін» і «Ісус з кап'ём» («Асмагласнік», 1730).

Літ.: Жудро Ф. История Могилевского богоявленского братства, Могилев, 1890; Шчакаціхіна М. Васіль Вашчанка — магілёўскі гравёр канца XVII — пач. XVIII ст., Мн., 1925; 450 год беларускага кнігадрукавання, Мн., 1968.

ВАШЧЫЛА Васіль (г. н. і см. невяд.), кіраўнік антыфеадальнага паўстання сялян Крычаўскага староства ў 1743—44. З 1731 няраз узначальваў выступленні сялян супраць феад. прыгнёту, за што яго арыштоўвалі і знявольвалі ў Крычаўскую турму. У канцы 1743 узначаліў узброенае паўстанне сялян. Паўстанцы грамілі маёнткі заможнай шляхты і ліхвяроў, зніштчалі даўгавыя кнігі. У студз. 1744 у бітвах пад Крычавам і в. Царкавішча войскі Радзівіла разбілі дрэнна ўзброеныя сялянскія атрады і жорстка расправіліся з паўстанцамі. В. ўдалося вырвацца з рук карнікаў і ўцячы на Украіну. Далейшы яго лёс невядомы. Гл. *Крычаўскае паўстанне 1743—44.*

В. І. Мялешка. Мінск.


ВАШЫНГТОН (Washington), штат на Ціхаакіянскім узбярэжжы ЗША. Пл. 176,6 тыс. км². Нас. 3,3 млн. чал. (1968). Адм. ц. Алімпія, найбольшы горад і прамысл. цэнтр Сіэтл. Уся тэр. занята гарамі і пласкагор'ямі (Берагавыя хрыбты, Каскадныя горы, Калумбійскае лававае плато). Клімат марскі, багаты на ападкі. Рэкі маюць вялікія запасы гідраэнергіі. Буйныя ГЭС. Выплаўка алюмінію і інш. каляровых металаў і ферасплаваў; электрахімія, атамная прамысл. Суднабудаванне, авіяцыйная, рыбакансервавая, папяровая, мэблевая, харч. прамысл. 1-е месца ў ЗША па нарыхтоўцы лесу. Перапрацоўка нафты з Канады. Невял. здабыча кам. вуг., каляровых металаў, золата. На ўзбярэжжы малочная жывёлагадоўля. У гарах гадуюць авечак. Ва ўнутр. раёнах пасевы пшаніцы, жыта, ячменю, на арашальных землях — сеяныя травы, яблыневыя сады (1-е месца ў ЗША па зборы яблыкаў). Развіта рыбалоўства. Па тэр. В. праходзяць важныя чыгункі і шашэйныя дарогі. Гал. порты Сіэтл і Такома. Праз Сіэтл падтрымліваюцца асноўныя сувязі ЗША з Аляскай.

ВАШЫНГТОН (Washington), сталіца ЗША. Каля ўсх. ўзбярэжжа краіны, на р. Патомак. Вузел аўтастрад і 5 магістральных чыгунак. Міжнар. аэрапорт. 764 тыс. ж. (1967). Горад утварае федэральную акругу Калумбія. З прыгарадамі, якія выходзяць за межы акругі, налічвае 2704 тыс. ж. (1967). Кіруе В. чыноўнік, якога назначае прэзідэнт краіны. Развіта пераважна мясцовая прамысл.: хлебабулачная, кандытарская, малочная. Друкарні.

Засн. ў 1791. З 1800 месца знаходжання ўрадавых устаноў, у 1802 атрымаў статус горада. Названы ў гонар прэзідэнта краіны Дж. Вашынгтона. Паскорана пачаў развівацца ў эпоху імперыялізму, калі надзвычай разрасся ўрадавы апарат. Насельніцтва В. пазбаўлена шэрагу палітычных правоў: не ўдзельнічае (у межах акругі Калумбія) у выбарах у кангрэс, не мае права на забастоўкі. У В. адбылася Вашынгтонская канферэнцыя 1921—22, размешчаны органы Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў. Планава забудоўваецца з канца 18 ст. (праект П. Ш. Ланфана і Т. Джэферсана). Пераважаюць урадавыя і адм. будынкі: Белы дом (рэзідэнцыя прэзідэнта, 1792—99, арх. Дж. Хобан), Капітолій (будынак кангрэсу, 1793—1827, арх. У. Торнтан) і інш. За межамі горада — Пентагон (ваеннае мін-ва, 1940).

У В. асноўныя навук. арг-цыі ЗША: Нац. АН, Амер. асацыяцыя садзеяння развіццю навукі, навук. ін-ты Карнегі і Брукінгса, Смітсанаўскі ін-т.

Вашынгтон. Капітолій.



санаўскі ін-т. У прыгарадзе даследчы цэнтр мін-ва с. гасп. З навук. т-ваў вядомыя: Амер. хімічнае, Нац. геаграфічнае, Амер. асацыяцыя вучоных-географаў, Амер. т-ва аховы прыроды і інш. Шэраг н.-д. лабараторый і канструктарскіх бюро. Больш за 10 ВНУ. Ун-ты: Джорджтаўнскі, Дж. Вашынгтона, Говардскі, Амерыканскі. Вышэйшая с.-г. школа, Ваенная акадэмія, нац. ваенны і ваенна-інжынерны каледжы. Найбольшая ў свеце б-ка кангрэсу. Нац. галерэя выяўленчых мастацтваў, карцінныя галерэі Коркарана і Фрыра.

ВАШЫНГТОН (Washington) Джордж (22.2.1732, Віргінія — 14.12.1799), дзярж. дзеяч, галоўнакамандуючы амерыканскай арміі ў *вайне за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*, першы прэзідэнт ЗША. З сям'і багатага плантатара-рабаўласніка. Выбраны членам 1-га і 2-га Кантынентальных кангрэсаў, выступаў супраць калан. палітыкі Англіі. 15.6.1775 прызначаны галоўнакамандуючым узбр. сіл ахопленых паўстаннем калоній. Пад кіраўніцтвам В. атрады каланістаў ператварыліся ў абучаную баяздольную армію, якая атрымала некалькі перамог над англ. войскамі. У 1786—87 актыўна ўдзельнічаў у ліквідацыі дэмакр. руху фермераў, рабочых, рамеснікаў. Пад кіраўніцтвам В. выпрацавана канстытуцыя 1787, якая з невялікімі зменамі дзейнічае і цяпер. Яна замацавала ўладу буржуазіі і буйных землеўладальнікаў. На аснове гэтай канстытуцыі двойчы выбраны прэзідэнтам ЗША (1789—97). Адзін з заснавальнікаў двухпартыйнай сістэмы ЗША.

Літ.: Юзефович П. С. Джордж Вашингтон и борьба за независимость Америки, М., 1941.

ВАШЫНГТОНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ 1921—22 па абмежаванні марскога ўзбраення і па далёкаўсходніх і ціхаакіянскіх пытаннях. Праходзіла ў Вашынгтоне з 12.11.1921 да 6.2.1922. Склікана па ініцыятыве ЗША. У В. к. ўдзельнічалі ЗША, Вялікабрытанія, Кітай, Японія, Францыя, Італія, Нідэрланды, Бельгія і Партугалія, а таксама дэлегаты Індыі і брыт. даміній — усяго 14 дзяржаў. РСФСР як далёкаўсходняя краіна не была запрошана на В. к. Не была дапушчана на канферэнцыю і дэлегацыя *Далёкаўсходняй рэспублікі* (прыбыла ў Вашынгтон у снеж. 1921).

Асн. дакументы В. к.: Дагавор чатырох дзяржаў (ЗША, Вялікабрытаніі, Японіі і Францыі) пра сумесную абарону іх «правоў» на астраўныя ўладанні і астраўныя тэрыторыі ў раёне Ціхага акіяна, падпісаны 13.12.1921. Гэта быў саюз калан. дзяржаў супраць нац.-вызв. руху народаў ціхаакіянскіх а-воў. Дагавор груба парушаў інтарэсы Сав. краіны і Кітая, бо ўключаў у зону свайго дзеяння паўд. частку сав. в-ва Сахаліна (Карафута) і кіт. а-вы Тайвань (Фармоза), Пэнху (Пескадорскія). Адначасова ён прадугледжваў ліквідацыю *англа-японскага саюза*, чаго і дамагаліся ЗША. Дагавор дзевяці дзяржаў (ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Японіі, Італіі, Бельгіі, Нідэрландаў, Партугаліі і Кітая) пра палітыку ў Кітаі, які абвяшчаў прынцыпы «адчыненых дзвярэй», г. зн. «роўнасці магчымасцей» у Кітаі для гандлю і прамысловасці ўсіх нацый. Падпісаны 6.2.1922. Даваляў ЗША як эканамічна найбольш магутнай дзяржаве выцесніць сваіх канкурэнтаў з Кітая, дае ранейдзейнічаў прынцып «сфер уплыву». Дагавор пяці дзяржаў (ЗША, Вялікабрытаніі, Японіі, Францыі і Італіі) пра абмежаванне марскога ўзбраення. Падпісаны 6.2.1922. Прадугледжваў наступныя суадносіны танажу лінейнага флоту названых дзяржаў — 5 : 5 : 3 : 1,75 : : 1,75, а таксама абмежаванні танажу і ўзбраенняў асобных лінкораў, авіяносцаў, крэйсераў. Дагавор уражоўваў ЗША в Вялікабрытаніі, да гэтага першай марской дзяржавай, і адсоўваў Японію на другое месца.

Рашэнні В. к. дапаўнялі *Версальскі мірны дагавор 1919* і зафіксавалі новыя суадносіны сіл імперыялістаў. дзяржаў на Д. Усходзе, што склаліся пасля 1-й сусв. вайны на карысць ЗША. Яны сталі састаўной часткай *версальска-вашынгтонскай сістэмы* пасляваен. падзелу свету і міжнар. адносін.

Публ.: Вашингтонская конференция по ограничению вооружений и тихоокеанским и дальневосточным вопросам 1921—1922 г. Полный перевод актов и документов, М., 1924. *Э. М. Позняк.* Мінск.

ВАЯВОДА, ваенны начальнік, правіцель. Як начальнік княскай дружыны ці нар. апалчэння В. ўпамінаецца ў рус. летапісах з 10 ст. Пазней В. стаяў на чале *ваяводства*.

ВАЯВОДКА (Wojewódka) Бярнард (г. н. невяд., Кракаў — ліп. 1554), польскі друкар і перакладчык. Па запрашэнні дзеяча рэфармацыі Мікалая Радзівіла Чорнага пераехаў у 1553 з Кракава ў Брэст. Аўтар кнігі па матэматыцы «Алгарытм — навука лічбы» (Кракаў, 1553). Пераклаў з лац. на польскую і выдаў у Брэсце тры кнігі прыхільнікаў рэфармацыі, у т. л. «Катэхізіс» М. Лютэра.

Літ.: Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku, zesz. 5 — Wielkie księstwo Litewskie, Wrocław — Kraków, 1959, s. 248—255.

С. Х. Александровіч. Мінск.

ВАЯВОДСТВА, 1) адм.-тэр. адзінка ў Вял. кн. Літ. і Рэчы Паспалітай. На Беларусі В. ўзніклі як ваенна-адм. акругі. Пры вялікім князю Альгердзе (1345—77) цэнтр. землі Беларусі былі падзелены на 2 часткі, якія ў 1413 увайшлі ў Віленскае і Троцкае В. У пач. 16 ст. В. сталі наз. землі Полацкая і Віцебская. Са складу Віленскага і Троцкага вылучаны ў самастойныя Навагрудскае, Падляскае, Берасцейскае (Брэсцкае), Мінскае і Мсціслаўскае В. Яны існавалі да канца 18 ст. У час акупацыі бурж. Польшчай Зах. Беларусі (1921—39) яе тэрыторыя ўваходзіла ў склад Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага В. 2) У Расіі 16—18 ст. сістэма кіравання, якое ўзначальвалася ваяводамі. 3) У ПНР — адм.-тэр. адзінка.

Літ.: Любавский М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно, 2 изд., М., 1915; Пичета В. И. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., М., 1961.

ВАЯН-КУЦЮР'Е (Vaillant-Couturier) Поль (8.1.1892, Парыж — 10.10.1937), французскі грамадскі і паліт. дзеяч, пісьменнік. Адзін з заснавальнікаў Франц. камуніст. партыі (1920), чл. ЦК ФКП (з 1921). З сям'і артыстаў. У 1913 выдаў першы зб. вершаў «Прыход пастуха». Удзельнічаў у 1-й сусв. вайне, далучыўся да інтэрнацыяналісцкага крыла Сацыяліст. партыі. Займаў антымілітар. пазіцыі (зб. апавяд. «Салдацкая вайна», 1919, з Р. Лефеўрам; аповесць «У адпачынку», 1919; «Пісьмы да маіх сяброў», 1920). У 1918 выбраны ў палату дэпутатаў. Удзельнік 3-га кангрэсу Камінтэрна ў Маскве (1921). У 1922 апублікаваў зб. рэ-

валюц. вершаў «Чырвоныя цягнікі» пра Кастрэв. і вызв. рух у Францыі. З 1926 рэд., у 1935—37 гал. рэдактар газ. *«Юманітэ»*. Выдаў зб. арт. і нарысаў «Месяц у Чырвонай Маскве» (1925), кн. нарысаў «Будаўнікі новага жыцця» (1932). Актыўна прапагандаваў метад сацыяліст. рэалізму. Выступаў у абарону рэсп. Іспаніі. Аўтар публіцыст. кн. «Няшчасце быць маладым» (1935) і аўтабіягр. аповесці «Дзяцінства» (1938).



Тв.: Рус. пер.— Избранное, Л., 1939; Избранное, М., 1956.

ВАЯНСКІ (Vajanský; сапр. Гурбан) Светазар (16.1.1847, Глбоке — 17.8.1916), славацкі пісьменнік, публіцыст і літаратурны крытык. Па прафесіі адвакат. Першы зб. вершаў «Татры і мора» (1879) пра нац.-вызв. барацьбу балканскіх народаў. Патрыят. лірыкай (зб. «З-пад ярма», 1884; «Вершы», 1890) і крытычнай дзейнасцю сцвярджаў рэалізм у славацкай л-ры. Аўтар аповесцей і раманаў («Маладняк», 1881; «Лятучыя цені», 1883; «Сухая галіна», 1884; «Корань і парасткі», 1896). Папулярызаваў рус. л-ру.

Тв.: Бел. пер.— Юдава поле, «Наша ніва», 1909, 24 вер., № 39; рус. пер.— у кн.: Словацкие повести и рассказы, М., 1953.

ВЕБ, Уэб (Webb) Сідней (13.7.1859—13.10.1947) і Беатрыса (22.1.1858—30.4.1943), муж і жонка, англійскія грамадскія дзеячы, тэарэтыкі трэд-юніянізму. Сідней В. у 1912—27 праф. Лонданскай эканам. школы. У 1922—29 чл. парламента ад лейбарысцкай партыі. Лорд з 1929. Беатрыса В. пачала дзейнасць у 80-я г. 19 ст. вывучэннем умоў жыцця і працы лонданскага пралетарыяту. Вебы разам напісалі многа кніг па гісторыі англ. рабочага руху. Гал. іх праца «Industrial democracy» (1897) выдадзена ў Расіі пад назвай «Тэорыя і практыка англійскага трэд-юніянізму» (1900—01). 1-ы том гэтага твора быў перакладзены на рус. мову У. І. Леніным, пераклад 2-га тома адрэдагаваны ім. У 1932 В. наведалі СССР. Вынікам іх паездкі з'явілася 2-томная праца «Савецкі камунізм — новая цывілізацыя?» (рус. пер. 1937). У 1942 апублікавана кніга Сіднея В. «Праўда пра Савецкую Расію». У абедзвюх кнігах аб'ектыўна і з дружалюбных пазіцый паказаны гістарычныя поспехі і гераізм савецкага народа.

ВЕБЕР (Weber) Карл Марыя фон (18.11.1786, Эйтын — 5.6.1826), нямецкі кампазітар, дырыжор, піяніст, музычны пісьменнік. Стваральнік ням. рамант. оперы і адзін з пачынальнікаў рамант. праграмнай музыкі. Найб. значэнне ў гісторыі муз. т-ра мела опера «Вольны стралок» (паст. 1821). Размоўныя дыялогі, простыя муз. нумары, апора на бытавыя жанры ідуць ад традыцый ням. зінгшпіля. Наяўнасць шэрагу буйных сцэн і асобных лейтматываў набліжае «Вольнага стралка» да сімфанізаваных опер-драм. «Эўрыянта» (1823) залажыла асновы ням. рыцарска-гераічнай вялікай оперы. Казачная опера «Аберон» (1826) зрабіла ўплыў на творы Ф. Мендэльсона, Г. Берліёза. Адкрыты кампазітарам прынцып драматургіі тэмбраў развілі Дж. Расіні, Г. Берліёз, Дж. Меербер, М. Глінка. Оперныя увертюры В.— першыя высокамаст. ўзоры рамант. праграмнага сімфанізму. Праграмныя таксама віртуозна-маляўнічы Канцэртштюк для фп. і арк. (1821) і фп. п'еса «Запрашэнне да танца» (1819, першая вальсавая паэма ў рамант. інстр. музыцы).



Літ. тв.: Рус. пер.— Жизнь музыканта. Главы из неоконченного романа, «Советская музыка», 1935, № 7—8, 10; Автобиографический набросок, там жа, 1936, № 12.

Літ.: Кенигсберг А. К. Карл-Мария Вебер, М.—Л., 1965.

ВЕБЕРАЎ АПАРАТ, орган некаторых касцістых рыб, які злучае плавальны пузыр з органам раўнавагі (лабірынтам унутранага вуха). Складаецца з трох костачак — відазмененых трох першых пазванкоў. Дае магчымасць рыбе хутка рэагаваць на змену ціску вады; магчыма, мае значэнне ў перадачы гукавых ваганняў. Названы па прозвішчы ням. анатама і фізіёлага Э. Вебера.

ВЕБЕРА — ФЕХНЕРА ЗАКОН, асноўны псіхафізічны закон, які выражае сувязь паміж зменай інтэнсіўнасці раздражнення і сілай выкліканага ім адчування. Пры павелічэнні сілы раздражнення ў геам. прагрэсіі інтэнсіўнасць адчування расце ў арыфм. прагрэсіі. Закон адкрыты ням. вучонымі Э. Веберам і Г. Фехнерам у 19 ст. Сапраўдны толькі для раздражняльнікаў сярэдняй сілы.

ВЕВЯРЫЦА (векша, белка), самы дробны намінал у грашовым абарачэнні Ст. Русі. У 10—13 ст. В. важыла ад 0,34 да 0,50 *г*, г. зн. ад $^1/_{150}$ да $^1/_{100}$ *грыўні*. Як рэальная манета не існавала, а была адзінкай ліку. Дзве В. адпавядалі заходнееўрап. *дэнарыю*.

ВЕГА (α Ліры), самая яркая зорка (0,1 зорнай велічыні) паўн. паўшар'я неба. Гарачы блакітнавата-белы гігант, у папярочніку ў 2,5 раза большы за Сонца. Адлегласць да яе вызначыў В. Я. Струве ў 1837 (8 *пс*). На тэр. БССР В. відаць вясной, летам і ўвосень.

ВЕГЕТАРЫЯНСТВА (ад лац. vegetarius раслінны), сістэма харчавання толькі раслінными прадуктамі («старавегетарыянцы») або раслінными разам з малочнымі і яйцамі («моладавегетарыянцы»). Як вучэнне ўзнікла ў Зах. Еўропе ў 1-й пал. 19 ст. У Расіі пашыралася ў 2-й пал. 19 ст., пераважна сярод сектантаў. Прыхільнікі В. абгрунтоўваюць гэтае вучэнне псеўданавуковым сцвярджэннем, што мясная ежа шкодзіць людзям. Сучаснае вучэнне пра рацыянальнае харчаванне прапа-

нуе мяшаную раслінна-жывёльную ежу, якая забяспечвае ўсе патрэбы арганізма ў харч. рэчывах і вітамінах. Гл. таксама *Харчаванне*.

ВЕГЕТАТЫЎНАЕ РАЗМНАЖЭННЕ, бясполае размнажэнне раслін і нізкаарганізаваных жывёл, пры якім з часткі мацярынскага арганізма развіваецца новы. У жывёльных арганізмаў В. р. адбываецца пачкаваннем (губкі, кішачнаполасцевыя, некат. чэрві, імшанкі, абалоннікі) або дзяленнем (прасцейшыя, плоскія і кольчатыя чэрві); у адноклетачных раслін — часцей дзяленнем; у ніжэйшых шматклетачных раслін — распадзіннем цела на часткі, якія могуць аднаўляцца; у вышэйшых раслін — карэнішчамі, чаранкамі, атожылкамі, цыбулінамі, клубнямі і інш. Многія культ. расліны размнажаюцца пераважна вегетатыўным спосабам (бульба, батат, тапінамбур). У садоўніцтве ўжываюць 2 спосабы В. р.: укараненне частак раслін (чаранкоў вінограду, парэчак, вусоў суніцы, атожылкаў агрэсту) і прышчэпліванне чаранкоў (садова-ягадныя культуры). Узнаўленне лясоў у значнай частцы ідзе В. р. (натуральнае — парасткамі ад каранёў або ад пня, штучнае — чаранкамі, каламі, дзяленнем кустоў і інш.). Пры В. р. расліны развіваюцца хутчэй, паўней перадаюцца спадчынныя прыкметы мацярынскага арганізма.

Літ.: Кренке Н. П. Трансплантация растений, М., 1966; Любинский П. А. Физиологические основы вегетативного размножения растений, Киев, 1957.

ВЕГЕТАТЫЎНАЙ НЕРВОВАЙ СІСТЭМЫ ХВАРОБЫ, паталагічныя змены яе стану і функцый. Узнікаюць ад інфекцый, інтаксікацыі, траўмаў, авітамінозаў, парушэнняў функцыі залоз унутранай сакрэцыі і інш. і паражаюць розныя ўчасткі нервовай сістэмы (ад кары галаўнога мозгу да перыферычных вегетатыўных канцоў у тканках і органах). Пры паталаг. працэсах у кары галаўнога мозгу можа зменьвацца інервацыя ўсіх органаў і тканак. Пры хваробах гіпаталамуса парушаюцца тэрмарэгуляцыя арганізма, абмен рэчываў, полавае пачуццё, адчуванне смагі, голаду і інш. Хваробы прадаўгаватага мозгу выклікаюць рэзкія парушэнні дыхання, дзейнасці сэрца, крывянога ціску, абменных працэсаў і інш. Пры паражэннях спіннога мозгу (у залежнасці ад месца) бываюць расстройствы сасударухальныя, трафічныя тазавых органаў. Хваробы вузлоў пагранічнага сімпатычнага ствала выклікаюць змены функцыі *вегетатыўнай нервовай сістэмы* ў зоне інервацыі гэтых вузлоў і выяўляюцца ў парушэнні жыўлення скуры, атрафіі або сцягванні мышцаў, у паяўленні болю ў іх. Ад запаленчых працэсаў у сонечным спляценні бывае прыступападобны боль пад грудзьмі, часам вадкі надворак, павышаецца крывяны ціск, парушаецца сардэчны рытм. Пры хваробах перыферычнай нервовай сістэмы вегетатыўныя неўрыты развіваюцца ў сядалішчным, сярэдзінным і трайнічным нервах, парушаюцца потааддзяленне, тонус і рэфлексы сасудаў; бываюць трафічныя расстройствы, пакутны боль. Вегетатыўна-сасудзістыя парушэнні выяўляюцца пры мігрэні, хваробе Рэйно, стэнакардыі, гіпертанічнай хваробе і інш. Лячэнне хвароб пачынаецца з ліквідацыі фактара, які іх выклікаў. Назначаюць антыбіётыкі (стрэптаміцын, біяміцын); адрэнакартыкатропны гармон (АКТГ); новакаінавую блакаду; хірургічнае лячэнне.

Літ.: Четвериков Н. С. Заболевания вегетативной нервной системы, М., 1968; Русецкий Н. И. Вегетативные нервные нарушения, М., 1958; Мисюк Н. С. и др. Элементы топической диагностики заболеваний нервной системы, Мн., 1963. *І. П. Антонаў.* Мінск.

ВЕГЕТАТЫЎНАЯ НЕРВОВАЯ СІСТЭМА, аўтаномная, анімальная, вісцэральная нервовая сістэма, аддзел нервовай сістэмы, які рэгулюе дзейнасць унутраных органаў і жыццёва важныя функцыі арганізма (абмен рэчываў, страваванне, тэрмарэгуляцыю і інш.).

Тэрмін «вегетатыўная» прапанаваў франц. анатам М. Біша (1800). В. н. с. мае цэнтральны і перыферычны аддзелы; па функцыянальных асаблівасцях падзяляецца на сімпатычную і парасімпатычную. Вегетатыўныя цэнтры сімпатычнай нервовай сістэмы складаюцца з нервовых клетак, размешчаных у гіпаталамічнай частцы, ва ўсіх аддзелах кары галаўнога мозгу і звязаных вегетатыўнымі нервовымі валокнамі з пагранічным сімпатычным стволам. Нервовыя вузлы (гангліі) апошняга, злучыўшыся між сабою, утвараюць ланцужок. Такія ланцужкі размешчаны абапал *пазваночніка*. Валокны перыферычнай часткі, што пачынаюцца з пагранічнага сімпатычнага ствала, адразу ідуць да ўнутр. органаў. Валокны ад бакавых рагоў спіннога мозгу перарываюцца ў нервовых спляценнях брушной поласці (сонечнае, падчарэўнае) і каля ўнутр. органаў (сардэчнае, лёгачнае, ныркавае і інш.), а потым ідуць да органаў страўнікава-кішачнага тракту. Вегетатыўныя цэнтры парасімпатычнай нервовай сістэмы размешчаны ў ствале галаўнога мозгу (сярэдні і прадаўгаваты мозг) і крыжавым аддзеле спіннога мозгу. Перыферычная частка (адросткі парасімпатычных нервовых клетак ствала галаўнога мозгу) перарываецца ў нервовых вузлах і ідзе разам з чэрапна-мазгавымі нервамі да зрэнак, спінных залоз, унутр. органаў. Нервовыя валокны, што ідуць ад крыжавага аддзела парасімпатычнай нервовай сістэмы, пасля перарыву ў нервовых гангліях тазавых органаў інервуюць мачавы пузыр, прамую кішку і полавыя органы. Кожны ўнутр. орган інервуецца абодвума аддзеламі В. н. с., функцыі якіх шмат чым процілеглыя. Пры раздражненні сімпатычнай нервовай сістэмы паскараецца рытм сардэчных скарачэнняў, павышаецца артэрыяльны ціск; узбуджэнне ж парасімпатычнай нервовай сістэмы запаволівае скарачэнні сэрца, зніжае крывяны ціск. Антаганізм двух аддзелаў В. н. с. не абсалютны. Інервуючы слінныя залозы, абодва аддзелы дапаўняюць адзін аднаго. Маючы розныя функцыі, сімпатычны і парасімп. аддзелы В. н. с. дзейнічаюць на органы адначасова і рэгулююць іх дзейнасць.

Даследаванні І. П. *Паўлава* і яго паслядоўнікаў паказалі, што кара вялікіх паўшар'яў галаўнога мозгу рэгулюе дзейнасць В. н. с. Гэтым тлумачыцца ўзнікненне вегетатыўных рэакцый у час псіхічных перажыванняў (пачырваненне і пабляднение скуры, змены сардэчнай дзейнасці, пот). У апошнія гады даказана, што мазжачок, рэтыкулярная фармацыя, гіпаталамус рэгулююць дзейнасць В. н. с. Яна кантралюе выдзяленне сліны, страўнікавага і кішачнага сокаў, тонус сасудзістай сценкі, рухальную функцыю мускулатуры ўнутр. органаў (сэрца, бронхаў, страўніка, кішэчніка, мачавога пузыра і інш.), забяспечвае жыўленне тканак, рост і размнажэнне.

У перадачы первовага імпульсу з адной нервовай клеткі на другую і з нервовых канчыкаў на рабочы орган у В. н. с. і ц. н. с. ўдзельнічаюць рэчывы ацэтылхалін і адрэналін. Пры гэтым адрэналін дзейнічае як сімпатычная нервовая сістэма, а ацэтылхалін як парасімпатычная. В. н. с. рэагуе на многія раздражненні, што ідуць з вонкавага і ўнутр. асяроддзя, забяспечваюць прыстасаванне і падтрымліваюць пастаянства ўнутр. асяроддзя арганізма. В. н. с. часам называюць аўтаномнай нервовай сістэмай, хоць гэтая аўтаномнасць адносная. Л. А. *Арбелі* паказаў, што В. н. с. інервуе не толькі ўнутр. органы, але і шкілетную мускулатуру, органы пачуццяў і самую ц. н. с. Пытанні сувязі марфалогіі і фізіялогіі В. н. с. распрацоўваюць вучоныя БССР на кафедры нармальнай анатоміі Мінскага мед. ін-та (акад. Д. М. *Голуб*), у Ін-це фізіялогіі АН БССР (акад. І. А. *Булыгін*).

Літ.: Голуб Д. М. Строение периферической первной системы в эмбриогенезе человека. Атлас, Мн., 1962; Иванов Г. Ф. Анатомия вегетативной нервной системы, у кн.: Многотомное руководство по неврологии, т. 1, кн. 2, М., 1957; Кнорре А. Г. и Лев И. Д. Вегетативная нервная система. Морфологический очерк, Л., 1963; Росин Я. А. Физиология вегетативной нервной системы, М., 1965. *І. П. Антонаў, А. М. Гурлення.* Мінск.

ВЕГЕТАТЫЎНЫЯ ОРГАНЫ (ад лац. vegetativus раслінны), органы індывідуальнага існавання расліны (прымацаванне да субстрату, жыўленне, ахова, перамяшчэнне і назапашванне рэчываў). У ніжэйшых раслін В. о.— усё іх цела, якое наз. слаявінай, або таломам (грыбніца, ці міцэлій, у грыбоў); у вышэйшых раслін — корань, сцябло, ліст і іх відазмяненні (карэнішчы, цыбуліны, клубні, вусікі, калючкі і інш.).

ВЕГЕТАЦЫЙНЫ ПЕРЫЯД (ад лац. vegetare вырастаць), 1) час жыццядзейнасці расліны, перыяд яе росту і развіцця; у зоне з умераным кліматам ахоплівае вясну, лета і частку восені. 2) Час, неабходны расліне, каб прайсці поўны цыкл развіцця, які канчаецца ўтварэннем спелых пладоў і насення. Працягласць В. п. вызначаецца колькасцю дзён з т-рай паветра вышэй за 5 °С. На ПдЗ Беларусі складаецца ў сярэднім з 205 дзён, у цэнтр. частцы — з 190—180, на ПпУ — з 180—175 дзён. На ПдЗ рэспублікі В. п. пачынаецца ў 1-й дэкадзе крас., на Пн і ПпУ — у другой.

«ВЕДАМАСЦІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК», штотыднёвае выданне Вярхоўнага Савета СССР. Выходзіць з 1938. На мовах саюзных рэспублік і рус. мове друкуе законы СССР, указы Прэзідыума Вярх. Савета СССР і міжнар. дагаворы, якія ім ратыфікуюцца.

ВЕДЗЬМА, рака, левы прыток Шчары (бас. Нёмана). Даўж. 35 *км*. Пачынаецца на зах. схілах Капыльскай грады, цячэ ў Нясвіжскім р-не Мінскай і Ляхавіцкім р-не Брэсцкай абласцей. Вадазбор (267 *км*²) градава-ўзгорысты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,5 *м*³/*сек*. На рацэ г. Ляхавічы.

ВЕДЗЯНЕЕЎ Барыс Яўгенавіч [21.12.1884 (2.1.1885), Тыфліс — 25.9.1946], савецкі вучоны ў галіне гідраэнергетыкі. Акад. АН СССР (1932). У 1909 скончыў Пецярбургскі ін-т інжынераў шляхоў зносін. У 1920 удзельнічаў у складанні плана ГОЭЛРО. Кіраваў буд-вам Волхаўскай і Дняпроўскай ГЭС. Праектаваў гідраабудаванні на Свіры, Куры, Каме, Іртышы. Удзельнічаў у буд-ве Маскоўскага метрапалітэна. Член Надзвычайнай Дзярж. Камісіі па высвятленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фаш. захопнікаў. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га і 2-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна. Дзярж. прэмія СССР 1943.

Тв.: Гидроэлектрические силовые установки, 2 изд., Л., 1926.

«ВЕДОМОСТИ» пятроўскія, першая руская друкаваная газета. Выдавалася па ўказу Пятра I з 2.1.1702 спачатку ў Маскве (да 1711), потым папераменна ў Пецярбургу і Маскве. Назвы мяняліся: «Ведомости», «Ведомости московские», «Ведомости о военных и иных делах...» і інш. Выходзіла перыядычна. Друкавала паведамленні пра перамогі арміі і флоту (рэляцыі), звесткі пра поспехі прамысл., гандлю і асветы, замежную інфармацыю. Рэдактары: Ф. Палікарпаў, з 1711 М. Аўрамаў, з 1719 Б. Волкаў. У 1727 «В.» перададзены Акадэміі навук, з 1728 выходзілі пад назвай *«Санкт-Петербургские ведомости»*.

ВЕДРЫЧ, рака, правы прыток Дняпра. Даўж. 68 *км*. Выток В. злучаны каналам з р. Сведзь (прыток Бярэзіны), і ва пачатак В. прыняты суток рэк за 1,5 *км* на ПдУ ад в. Уюнішча Калінкавіцкага р-на. Цячэ ў Калінкавіцкім і Рэчыцкім р-нах Гомельскай вобл. Вадазбор (1330 *км*²) плоскі, слаба акрэслены. Рэчышча ракі каналізаванае. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 5 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры асушэнні балот.

ВЕДРЫЧ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Падпарадкоўваецца Васілевіцкаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр саўгаса «Ведрыч». За 55 *км* на З ад Рэчыцы, 105 *км* ад Гомеля, 5 *км* ад чыг. ст. Васілевічы. 1395 ж., дварoў 411 (1970). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячыя сад і яслі, сталовая, 2 магазіны.

СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ НА АСОБНЫХ АРКУШАХ

Афорт — 6 ілюстрацый (аўтатыпія) . . 16—17
Ахрэмчык — 1 ілюстрацыя (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . . 16—17
Балгарыя — 17 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 96—97
Балет — 19 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 100—101
Барока — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) 152—153
Батлейка — 13 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 152—153
Батальны жанр — 10 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . 176—177
Белавежская пушча — 13 ілюстрацый на дзвюх старонках (афсет) . . . . 204—205
Бел. с. г. акадэмія — 7 ілюстрацый (афсет) . . . . . 232—233
Бел. аўтамабільны завод — 6 ілюстрацый (афсет) . . . . . 232—233
Бел. дзяржаўны універсітэт — 9 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 240—241
Бел. політэхнічны інстытут — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 240—241
Бел. тэатр імя Я. Купалы — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 248—249
Бел. тэатр імя Я. Коласа — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 248—249
Бел. тэатр оперы і балета — 15 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 248—249
Бел. тэатр юнага гледача — 7 ілюстрацый (аўтатыпія) . . . . . 518—519
Бельгія — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) 288—289
Бембель — 1 ілюстрацыя (глыбокі друк) 288—289
Берлін — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) 304—305
Бразілія — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) 304—305
Бронза — 9 ілюстрацый (глыбокі друк) 400—401
Бронзавы век — 13 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 400—401
Брэст — 7 ілюстрацый (глыбокі друк) 424—425
Брэсцкая вобласць — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 424—425
Брэсцкая крэпасць — 14 ілюстрацый на дзвюх старонках (афсет) . . . . 432—433
Будаўніцтва — 7 ілюстрацый (афсет) . 448—449
Буйная рагатая жывёла — 9 ілюстрацый (афсет) . . . . . 448—449
Бульба — 18 ілюстрацый (афсет) . . . 464—465
Бульбаводства — 6 ілюстрацый (афсет) 464—465
Бытавы жанр I — 7 ілюстрацый (аўтатыпія) . . . . . 496—497
Бытавы жанр II — 3 ілюстрацыі (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . 496—497
Бялыніцкі-Біруля — 1 ілюстрацыя (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . 518—519
Бярэзінскі запаведнік — 10 ілюстрацый на дзвюх старонках (афсет) . . . 528—529
Вавілонія — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 536—537
Візантыя — 9 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 536—537

СПІС КАРТАЎ

Афрыка, геалагічная (каляровая) . . . 8—9
Афрыка, палітычная (каляровая) . . . 8—9
Афрыка, фізічная (каляровая) . . . . 8—9
Афрыка, этнаграфічная (каляровая) . 8—9
Ашмянскі раён 25
Бабруйская аперацыя 1944 г. (каляровая) . . . . . 216—217
Бабруйскі раён 48
Балгарыя (каляровая) . . . . . 96— 97
Балгарыя Волжска-Камская ў X—XII ст. 99
Балгарыя, эканамічная 95
Балівія 103
Балканскі паўвостраў 106
Барадзінская бітва 133
Баранавіцка-Слонімская аперацыя 1944 (каляровая) . . . . . 216—217
Баранавіцкі раён 139
Барысаўскі раён 168
Баспорская дзяржава ў IV—II ст. да н. э. 175
Батсвана 182
Башкірская АССР 191
Беларуская энергетычная сістэма . . 235
Белгародская вобласць 276
Бельгія, Нідэрланды і Люксембург (каляровая) . . . . . 96—97
Бельгія, эканамічная 284
Бераг Слановай Косці 293
Бераставіцкі р-н 298
Берлінская аперацыя 1945 г. 306
Бешанковіцкі раён 319
Бірма 334
Бірма, эканамічная 336
Брагінскі раён 377
Бразілія (каляровая) . . . . . 384—385
Бразілія, эканамічная 384
Бранская вобласць 392
Браслаўскі раён 394
Бронзавы век (каляровая) . . . . . 384—385
Брэсцкая вобласць (каляровая) . . . 424—425
Брэсцкая вобласць, эканамічная (каляровая) . . . . . 424—425
Брэсцкі мір 1918 г. 434
Брэсцкі раён 437
Буда-Кашалёўскі раён 442
Бурацкая АССР 473
Бурундзі 480
Бухарская вобласць 487
Быхаўскі раён 498
Бялыніцкі раён 518
Бярозаўскі раён 526
Бярэзінская аперацыя 1920 г. 531
Бярэзінскі раён 530
Валагодская вобласць 565
Валгаградская вобласць 571
Валожынскі раён 576
Валынская вобласць 582
Варашылаўградская вобласць 599
Варонежская вобласць 602
Ваўкавыскі раён 625
Вызваленне Беларусі ад фашысцкіх акупантаў у выніку Беларускай аперацыі 1944 г. (каляровая) . . . . . 216—217
Крэпасць-герой Брэст (схема) 422
Схема Беларускай чыгункі 234
Тарфяна-балотныя вобласці БССР . . . 109

СПІС АСНОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ, ПРЫНЯТЫХ У БелСЭ

а — ампер
Å — ангстрэм
аб/мін — абаротаў за мінуту
абс. — абсалютны
абх. — абхазскі
а. в. — аўтаномная вобласць
а · гадз — ампер-гадзіна
агр. — аграрны
адв. — адвітак
адж. — аджарскі
адм. — адміністрацыйны; адмірал (пры імю)
адм.-тэр. — адміністрацыйна-тэрытарыяльны
адм. ц. — адміністрацыйны цэнтр
азб. — азбеставы
азерб. — азербайджанскі
ак. — акцыя; акорд
акв. — акварэль
акр. — акруговы; акруга (пры назве)
алб. — албанскі
алг. — алгебраічны
алж. — алжырскі
амер. — амерыканскі
a-moll — мінорная танальнасць
АМРР — Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыйнай Расіі
АН — Акадэмія навук
анат. — анатамічны
англ. — англійскі
анс. — ансамбль (муз., арх., пры назве)
ант. — антычны
араб. — арабскі
арг. — аргенцінскі
арган. — арганічны
арк. — аркестравы
арм. — армянскі
арт. — артыкул; артыст (пры назве або імю)
артыл. — артылерыйскі
арх. — архітэктурны; архітэктар (пры імю)
АСЕАН — афіцыйная назва асацыяцыі эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва краін Паўднёва-Усходняй Азіі
асір. — асірыйскі
астр. — астранамічны
ат — атмасфера тэхнічная
ат. адз. — атамная адзінка
атл. — атлантычны
ат. м. — атамная маса
атм. — атмасферны
атр. — атрад (у біялогіі)
аўт. — аўтаномны
аўтам. — аўтаматычны
аўстр. — аўстрыйскі
аўстрал. — аўстралійскі
афг. — афганскі
афіц. — афіцыйны
афр. — афрыканскі
АЭС — атамная электрастанцыя
б. — былы (пры назве)
б. г. — без году (у бібліягр.)
Б. Усход — Блізкі Усход
балг. — балгарскі
бас. — басейн
бат. — батанічны
башк. — башкірскі
БДУ — Беларускі дзяржаўны універсітэт
бел. — беларускі
бельг. — бельгійскі
біял. — біялагічны
б. м. — без месца (у бібліягр.)
браз. — бразільскі
брыт. — брытанскі
б-та — балота
буд. м. — будаўнічы матэрыял
бур. — бурацкі
б. ч. — большая частка
в — вольт
в. — вёска (пры назве); выпуск (у бібліягр.)
вак. — вакальны
в-аў — вастраў
вб — вэбер
вегет. — вегетацыйны
вер. — верасень
верт. — вертыкальны
вет. — ветэрынарны
візант. — візантыйскі
ВМС — ваенна-марскія сілы
ВМФ — ваенна-марскі флот
вол. — воласць (пры назве)
ВПС — ваенна-паветраныя сілы
ВРК — ваенна-рэвалюцыйны камітэт
ВСНГ — Вышэйшы савет народнай гаспадаркі
вт — ват
вт · гадз — ват-гадзіна
ВЧ — высокая частата
выбр. — выбраны
вызв. — вызваленчы
вытв. — вытворчы; вытворчасць
выш. — вышыня
г. — горад; гара (пры назвах); год
геагр. — геаграфічны
геад. — геадэзічны
геал. — геалагічны
геам. — геаметрычны
геафіз. — геафізічны
ген. — генеральны; генерал (пры імю)
ген.-л. — генерал-лейтэнант (пры імю)
ген.-м. — генерал-маёр (пры імю)
ген.-палк. — генерал-палкоўнік (пры імю)
генет. — генетычны
герм. — германскі
ГК — Грамадзянскі кодэкс
гл — гекталітр
гл. — глядзі
гм — гектаметр
гн — генры
г. н. невяд. — год нараджэння невядомы
г. п. — гарадскі пасёлак; пасёлак гарадскога тыпу
ГПК — Грамадзянска-працэсуальны кодэкс
гр. — група (хім.)
°С — градус стоградуснай шкалы Цэльсія
К — градус абсалютнай шкалы Кельвіна
°R — градус Рэамюра
°F — градус Фарэнгейта
груз. — грузінскі
грэч. — грэчаскі
гс — гаўс
губ. — губерня
гц — герц
Гэв — гігаэлектрон-вольт
Д. Усход — Далёкі Усход
даг. — дагестанскі
даг — дэкаграм
дал — дэкалітр
дам — дэкаметр
ДАСТ — дзяржаўны агульнасаюзны стандарт
даўж. — даўжыня
дац. — дацэнт
дб — дэцыбел
дг — дэцыграм
дж — джоўль
дл — дэцылітр
дм — дэцыметр
д-р — доктар
д-р. н. — доктар навук
ДРЭС — дзяржаўная раённая электрастанцыя
дыв. — дывізія
дыв-ён — дывізіён
дыс. — дысертацыя
егіп. — егіпецкі
ж. — жыхар
жал. — жалезны
жн. — жнівень
жыл. — жыллёвы
З — Захад (напрамак свету)
засл. — заслужаны
засл. арт. — заслужаны артыст
засл. дз. культ. — заслужаны дзеяч культуры
засл. дз. маст. — заслужаны дзеяч мастацтва
засл. дз. нав. і тэхн. — заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі
засн. — заснаваны
заўв. — заўвага
зах. — заходні
зах. д. — заходняя даўгата
зб. — зборнік (пры назве)
з-д — завод
ілл. — ілюстрацыя
інд. — індыйскі
інданез. — інданезійскі
інж. — інжынеры; інжынер (пры імю)
інстр. — інструментальны
ін-т — інстытут
іншам. — іншамоўны
ірл. — ірландскі
ісп. — іспанскі
італьян. — італьянскі
к — кулон
каап. — кааператыўны
каб.-балк. — кабардзіна-балкарскі
кав. — кавалерыйскі
каз. — казахскі
кал — калорыя малая
калан. — каланіяльны
калм. — калмыцкі
кам. — камерны
камб. — камбінаваны
кан. — канадскі
канд. — кандыдат
кар. — карэйскі
каракалп. — каракалпакскі
касм. — касмічны
кастр. — кастрычнік
каўк. — каўказскі
каэф. — каэфіцыент
кв — кілавольт
квт — кілават
квт · гадз — кілават-гадзіна
кг — кілаграм
кг-атам — кілаграм-атам
кг-мал — кілаграм-малекула
кгс — кілаграм-сіла
кгц — кілагерц
кдж — кіладжоўль
КЗаП — Кодэкс законаў аб працы
кірг. — кіргізскі
кіт. — кітайскі
КК — Крымінальны кодэкс
ккдз — каэфіцыент карыснага дзеяння
ккал — кілакалорыя
кл — кілалітр
кл. — клас
км — кіламетр
км/гадз — кіламетраў за гадзіну
км/сек — кіламетраў за секунду
кн. — кніга; князь (пры назве, пры імю)
К° — кампанія
КПК — Крымінальна-працэсуальны кодэкс
Кр. — крыніца (у бібліягр.)
крас. — красавік
к. с. — конская сіла
к-т — камітэт
к-та — кіслата
кэв — кілоэлектрон-вольт
Л. — Ленінград (у бібліягр.)
латв. — латвійскі
лац. — лацінскі
лац.-амер. — лацінаамерыканскі
лек. — лекавы
ліп. — ліпень
ліст. — лістапад

літ. — літаратурны; літаратура (у бібліягр.); літоўскі
лк — люкс
лм — люмен
л-ра — літаратура
м. — мыс; мора
М.— малы (пры назве); Масква (у бібліягр.)
ма — міліампер
маж. — мажорны
македон. — македонскі
малд. — малдаўскі
манг. — мангольскі
мар. — марыйскі
мардав. — мардоўскі
маск. — маскоўскі
маслар. — масларобчы
маст. (кір.) — мастацтва; мастацкі (кіраўнік)
мат.-тэхн. — матэрыяльна-тэхнічны
мб — мілібар
м. м. — малекулярная маса
мв — мілівольт
мвт — міліват
мг — міліграм
мг% — міліграм %
мгадз — метраў за гадзіну
Мгц — мегагерц
МДФЖ — Міжнародная дэмакратычная федэрацыя жанчын
мед. — медыцынскі
мекс. — мексіканскі
мех. — механічны
МЖС — машынна-жывёлагадоўчая станцыя
мін — мінута
мін. — мінорны; міністр
мін-ва — міністэрства
мінер. — мінеральны
мк — мікрон
мка — мікраампер
мкв — мікравольт
мкм — мікраметр
мкс — максвел
мкф — мікрафарада
мл — мілілітр
млекакорм. — млекакормячыя
М.— Л.— Масква — Ленінград (у бібліягр.)
мм — міліметр
ММС — машынна-меліярацыйная станцыя
Мн.— Мінск (у бібліягр.)
м/сек — метраў за секунду
МТС — машынна-трактарная станцыя
муз. — музычны
мусульм. — мусульманскі
Мэв — мегаэлектрон-вольт
мяст. — мястэчка
н — ньютан
н. — нарадзіўся
найб. — найбольшы; найбольш
наз. — называецца
нам. — намеснік
нап.— напісана
напр.— напрыклад
нар. — народны
нарв. — нарвежскі
нас. — насельніцтва
наст.— наступны
нац. — нацыянальны
нач. — начальнік
нерж. — нержавейны
нідэрл.— нідэрландскі
новазел. — новазеландскі
н. ст. — новы стыль
н. э. — наша эра
ням. — нямецкі
ням.-фаш. — нямецка-фашысцкі
ом — ом
П.— Петраград, Пецярбург (у бібліягр.)
п. — памёр
пав. — павет
пал. — палова
палігр. — паліграфічны
палінез. — палінезійскі
пам. — памочнік
парт. — партыйны
партуг. — партугальскі
партыз. — партызанскі
пас. — пасёлак
п-аў — паўвостраў
паўд. — паўднёвы
паўд.ш. — паўднёвая шырата
паўн. — паўночны
паўн. ш. — паўночная шырата
паўн.-асец. — паўночна-асецінскі
пач. — пачатак; пачатковы
пашыр. — пашырана
Пд — Поўдзень
ПдЗ — паўднёвы захад
ПдУ — паўднёвы ўсход
пед. — педагагічны
пер. — пераклад
перав. — пераважна
перс. —персідскі
пл. — плошча
плем. — племянны
Пн — Поўнач
ПнЗ — паўночны захад
ПНР — Польская Народная Рэспубліка
ПнУ — паўночны ўсход
ППА — проціпаветраная абарона
ППХА — проціпаветраная і проціхімічная ахова
прав. — правінцыя
правадз. (чл.) — правадзейны (член)
прадпр. — прадпрыемства
практ. — практычны
праф. —прафесар
прац. — працоўны
псеўд. — псеўданім
Публ.— публікацыя (у бібліягр.)
р — рэнтген
р. — рака (пры назве)
раздз. — раздзел
рас. — расійскі
расл. — расліннасць
р-н — раён (пры назве)
РВС — рэўваенсавет
РТС — рамонтна-тэхнічная станцыя
рт. сл. — ртутны слупок
руб. — рубель
рум. — румынскі
рус. — рускі
р. ц. — раённы цэнтр
рым. — рымскі
рыс. — рысунак
рэг. т. — рэгістравая тона
рэд. — рэдактар; рэдакцыя; рэдакцыйны
рэж. — рэжысёр (пры імю)
с. — старонка; сяло (пры назве)
сав. — савецкі
сак. — сакавік
сан. — санітарны
санскр.— санскрыцкі
сац. — сацыяльны
сг — сантыграм
с.-г. — сельскагаспадарчы
с. гасп. — сельская гаспадарка
с.-д. — сацыял-дэмакратычны; сацыял-дэмакрат (пры імю)
сек — секунда
сіб. — сібірскі
сім. — сіметрычны
сімф. — сімфанічны; сімфонія (пры назве)
сінт. — сінтэтычны
сканд. — скандынаўскі
СКБ — спецыяльнае канструктарскае бюро
скл.— скланенне; скліканне; складальнік (у бібліягр.)
сл— сантылітр
слав. — славянскі
см — сантыметр
снеж. — снежань
СПб.— Санкт-Пецярбург (у бібліягр.)
ст. — стагоддзе; стагоддзі; станцыя
Ст. — Старажытны (у назвах: Старажытны Рым, Старажытная Русь і пад.)
стат. — статыстычны
стр. — струнны
студз. — студзень
суд. — судовы
сусв. — сусветны
СФДМ — Сусветная федэрацыя дэмакратычнай моладзі
СФП — Сусветная федэрацыя прафсаюзаў
сх. — схема
сям. — сямейства
сцэн. — сцэнічны
т — тона
т. — том
t°, т-ра — тэмпература
t кіп. — тэмпература кіпення
t пл. — тэмпература плаўлення
табл. — табліца
тадж. — таджыкскі
танц. — танцавальны
тат. — татарскі
ткм — тонакіламетр
т-р — тэатр
ТРАМ — тэатр рабочай моладзі
тув. — тувінскі
тур. — турэцкі
туркм. — туркменскі
т. ч. — такім чынам
тыс. (ж.) — тысяча (жыхароў)
тэр. — тэрыторыя
У — Усход
УВЧ — ультравысокія частоты
удз. в. — удзельная вага
удз. м. — удзельная маса
удм. — удмурцкі
узб. — узбекскі
узв. — узвышша (пры назве)
узнаг. — узнагароджаны
узр. (м.) — узровень (мора)
укл. — уключна
УКП — Усеагульная канфедэрацыя працы
укр. — украінскі
УКХ — ультракароткія хвалі
ун-т — універсітэт
усх. — усходні
усх. д. — усходняя даўгата
у т. л. — у тым ліку
у. х. — ударная хваля
ф — фарада
ф. — фунт
фаб. — фабрычны
фанет.— фанетычны
фаш. — фашысцкі
феад. — феадальны
фельч.-ак. пункт — фельчарска-акушэрскі пункт
фіз. — фізічны
фізіял. — фізіялагічны
філал. — філалагічны
філас. — філасофскі
фін. — фінансавы; фінскі
фінл. — фінляндскі
ф-ка — фабрыка
ф-ла — формула
флам. — фламандскі
фп. — фартэпіяна
фр. — франк
франц. — французскі
ф. ст. — фунт стэрлінгаў
ф-т — факультэт
хар. — харавы
харч. — харчовы
хім. — хімічны
хр. — хрыбет (пры назве)
ц — цэнтнер
ц. — царква
цв. — цвёрдасць
ц/га — цэнтнераў на гектар (з гектара)
цэнтр. нерв. сістэма — цэнтральная нервовая сістэма
цукр. — цукровы
цэм. — цэментавы; цэментны
ЦЭС — цеплаэлектрастанцыя
ЦЭЦ — цеплаэлектрацэнтраль
цюрк. — цюркскі
ч. — частка
час. — часопіс (пры назве)
чл. — член
чл.-кар.— член-карэспандэнт
чув. — чувашскі
чыг. — чыгунка
чыг.-ліц. — чыгуналіцейны
чыг.-плав. — чыгунаплавільны
чэрв. — чэрвень
чэч.-інг. —чэчэна-інгушскі
чэш. — чэшскі
шатл. — шатландскі
швед. — шведскі
швейц. — швейцарскі
шт. — штука
шчыльн. — шчыльнасць
шыр. — шырыня
э — эрстэд
эв — электрон-вольт
ЭВМ — электронная вылічальная машына
эл. — электрычны
эл.-магн. — электрамагнітны
эрг — эрг
эрс — электрарухальная сіла
эст. — эстонскі
югасл. — югаслаўскі
як. — якуцкі
які-н. — які-небудзь
яп. — японскі
яўр. — яўрэйскі

СУПРАЦОЎНІКІ НАВУКОВА-ГАЛІНОВЫХ, КАНТРОЛЬНЫХ РЭДАКЦЫЙ І АДДЗЕЛАЎ БелСЭ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 2 ТОМА

Біялогія, медыцына і сельская гаспадарка

Заг. рэд.— канд. біял. навук Р. К. Кажэўнікава; ст. навук. рэдактары: Л. М. Гаршанава, М. А. Кулікава; навук. рэдактары: В. М. Прусакова, А. У. Усцінава; мал. рэдактар М. В. Стральчэня.

Геаграфія і геалогія

Заг. рэд.— Я. А. Якубоўскі; ст. навук. рэдактар У. І. Шкуратаў; навук. рэдактары: В. П. Варанцова, В. М. Вераценнікава, Т. І. Гузава, С. В. Курач, А. А. Шаўрова; рэдактар В. С. Вайткевіч.

Гісторыя КПСС, СССР і БССР

Заг. рэд.— канд. гістар. навук І. П. Хаўратовіч; ст. навук. рэдактары: А. І. Марозава, Н. А. Русак, В. С. Семенякоў; навук. рэдактары: В. М. Барадуліна, В. В. Гетаў, Н. У. Капранава, В. С. Паваліхіна; мал. рэдактары: А. І. Валаховіч, В. В. Гусева.

Літаратура, фальклор і мова

В. а. заг. рэд.— У. І. Саламевіч; ст. навук. рэдактар В. К. Небышынец; мал. рэдактар Р. А. Ларчанка.

Мастацтва і архітэктура

Заг. рэд.— канд. мастацтвазнаўства Г. І. Барышаў; ст. навук. рэдактар А. А. Саламаха; навук. рэдактары: М. М. Клімковіч, Дз. У. Стэльмах; рэдактар Г. П. Прахарэнка.

Народная асвета і друк

Заг. рэд.— І. І. Смірнова; навук. рэдактар А. С. Ткачова; рэдактар Н. І. Стаховіч.

Тэхніка

Заг. рэд.— Л. С. Караічаў; ст. навук. рэдактар У. М. Сацута; навук. рэдактары: І. У. Косціна, В. С. Мельнікаў.

Усеагульная гісторыя

Заг. рэд.— канд. філас. навук Да. М. Мацяс; ст. навук. рэдактар А. Дз. Зубар; навук. рэдактар Н. І. Кліменка; мал. рэдактар Г. М. Булат.

Фізіка, матэматыка, хімія і астраномія

Заг. рэд.— канд. фіз.-матэм. навук А. І. Болсун; ст. навук. рэдактар В. В. Хадыка; навук. рэдактар Т. М. Яноўская; мал. рэдактар З. І. Іўчанка.

Філасофія і права

Заг. рэд.— А. П. Ратайка; ст. навук. рэдактар канд. юрыдычных навук А. А. Прымачонак; навук. рэдактар А. І. Кавачок.

Эканоміка

Заг. рэд.— У. А. Салановіч; навук. рэдактар А. А. Краўчанка; рэдактар Н. П. Саламевіч; мал. рэдактар Н. К. Матвеенцава.

Навукова-кантрольная рэдакцыя

Заг. рэд.— канд. эканам. навук Э. А. Юшкевіч; ст. навук. рэдактары: Т. Дз. Арлова, І. Я. Афнагель, З. П. Кузьмічэнка; навук. рэдактары: С. П. Самуэль, Т. У. Тамільчык; мал. рэдактар К. П. Мацяс.

Група слоўніка. Ст. навук. рэдактар Н. П. Колас; навук. рэдактар І. П. Крэнь; рэдактар В. А. Міхайлоўская.

Група бібліяграфіі. Навук. рэдактары: Т. Р. Сабаленка, А. А. Тарасава; мал. рэдактар Н. І. Кукіна.

Літаратурна-кантрольная рэдакцыя

Заг. рэд.— І. А. Скрыган; ст. навук. рэдактары: М. К. Клышка, В. І. Рабкевіч; навук. рэдактар Н. М. Сямашка; рэдактары: М. Э. Самуйлёнак, Е. П. Фешчанка.

Група транскрыпцыі. Навук. рэдактар І. А. Ясінская; мал. рэдактар Н. Я. Ніканюк.

Рэдакцыя ілюстрацыі і картаграфіі

Заг. рэд.— І. Р. Славянін; ст. навук. рэдактар С. П. Русак; навук. рэдактар В. А. Ярмоленка; мал. рэдактар Л. А. Бажко.

Група картаграфіі. Ст. навук. рэд.-картограф Н. М. Махавікова; навук. рэд.-картограф Г. Р. Шыкунова; рэд.-картограф Я. П. Цупа.

Група падрыхтоўкі фотаілюстрацый. Р. Ф. Валадзько, П. М. Захарэнка.

Група камплектавання

Рэдактар М. І. Макаранка; мал. рэдактар Л. В. Хамко; заг. навук. архіва А. С. Жмуроўскі.

Карэктарскі аддзел

Заг. аддзела — Г. І. Ткачова; ст. карэктары: Н. Ф. Багдановіч, В. І. Плашчынская, М. А. Федасеенка; карэктары: Л. Дз. Нікульшына, Л. А. Сінякевіч.

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — У. М. Вержбаловіч; ст. тэхн. рэдактары: Г. І. Аніскевіч, Н. П. Сцяпанава; выпускаючы З. М. Белавус.

Лабараторыя фотакапіравальных размнажальных апаратаў. Загадчык В. А. Трубчак; лабаранты: М. П. Бажнаў, Я. М. Кузьміна.

Загадчыкі службаў Галоўнай рэдакцыі БелСЭ

Планава-эканам.— Н. Л. Штульман; забеспячэння — Л. В. Мурашка; гал. бухгалтар Н. П. Куцанава; ст. інспектар Л. П. Маліноnак.

Навуковая бібліятэка

Ст. бібліятэкар А. Я. Ніхайчык.

Машынапіснае бюро

Заг. бюро Л. Л. Ляшчынская; машыністкі: Г. Л. Анісімава, Л. С. Іванова, Т. А. Навіцкая, Н. П. Ракіцкая.

ВЫТВОРЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ УДЗЕЛЬНІЧАЛІ У ВЫДАННІ БелСЭ

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа

Дырэктар Р. А. Шаўчэнка; галоўны інжынер С. Ц. Сівяненка; галоўны тэхнолаг Р. І. Шапавалава; начальнік вытворчага аддзела К. С. Каламейцава; начальнік наборнага цэха К. П. Федарук; ст. майстар цэха В. А. Салдаценка; тэхнолаг цэха Л. В. Абраменка; майстры лінатыпнага аддзялення: В. С. Вітушка, Г. У. Крыштаповіч; лінатыпісткі: Н. Ф. Церахава, Г. Я. Жардзецкая; майстар вярстальнага аддзялення Е. І. Фінкель; вярстальшчык І. П. Казлоўскі; майстар абкладачнага аддзялення П. А. Колік; майстар цынкаграфіі М. А. Гарбачоў; аператар варыяклішографа У. П. Стукач; травільшчыкі: В. П. Апарын, Б. І. Акола; заг. карэктарскай Л. І. Ліхтаровіч; карэктары: Л. В. Апаровіч, Э. Я. Зялеўская; начальнік друкарскага цэха А. М. Капусцік; ст. майстар цэха М. У. Яскевіч; тэхнолаг цэха Г. Л. Валчок; майстры цэха: А. І. Гладун, Л. Я. Рашэтнікава, Я. Да. Жукоўская; брыгада друкароў: Ф. В. Навахрост, М. М. Левін, І. М. Мілеўскі, У. А. Бабурка, Р. М. Бандарэнка; начальнік афсетнага цэха Г. Г. Каралёва; тэхнолаг цэха Я. А. Куляшова; майстар рэтушорнага аддзялення В. П. Міхальчын; рэтушор У. В. Мішкоў; майстры друкарскага аддзялення: І. М. Бялько, Г. М. Рабухін; брыгада друкароў: П. М. Парфенчык, П. І. Карпіловіч; начальнік палачнага цэха Т. В. Мельнік; тэхнолаг цэха Н. Д. Асадоўская; майстар Н. М. Дражына; пазалотчыцы: Н. П. Шарапава, М. П. Варанкова, Л. А. Кіневіч; начальнік пераплётна-брашуровачнага цэха Б. І. Штульман; ст. майстар цэха З. А. Худава; тэхнолаг цэха В. М. Савіцкая; майстры цэха: Н. В. Крылова, І. А. Сінкевіч, З. С. Ячнік, Э. У. Бубёнава; машыніст БТГ Л. В. Квяткоўскі; устаўшчыца С. Ц. Граковіч; швачкі: К. С. Левандоўская, Я. З. Няхайчык; машыніст БПА Т. Ф. Івановіч; прыклейшчыцы: С. С. Раманчык, І. Ю. Гладкая; рэзчыкі: Т. М. Сідарэнка, Н. Я. Шкода.

Друкарня Выдавецтва ЦК КПБ

Дырэктар П. А. Цароў; галоўны інжынер П. В. Карпаў; намеснік дырэктара па вытворчасці С. Г. Сцяпанаў; галоўны тэхнолаг Р. І. Жытомірскі; начальнік цэха глыбокага друку С. М. Пасмлюха; фатограф М. А. Роганаў; рэтушоры: М. Л. Ваданос, У. Д. Бурак; травільшчыкі: Г. А. Лепскі, Я. В. Гаўрылаў; друкары: В. К. Клачко, П. М. Чупрыс.

Фабрыка № 2 ГУГК пры Савеце Міністраў СССР

Дырэктар В. В. Урусаў; галоўны інжынер А. А. Ляўшынаў; начальнік цэха № 1 М. С. Руткоўская; ст. рэдактар Г. І. Гулюк; рэдактары: В. С. Собалева, Т. С. Бірэгал; інжынеры-картографы: Л. Ф. Жмака, А. В. Бальшакова; тэхнікі-картографы: М. А. Міхалкевіч, Ч. П. Зубчонак; тэхнічны рэдактар І. Г. Раманюк; начальнік цэха № 2 А. І. Бабуркін; ст. майстар А. В. Свірына; прабіст А. М. Багдановіч; гравёр Г. А. Атамановіч; капіроўшчык М. М. Васілеўскі; начальнік цэха № 3 Я. І. Негнявіцкі; ст. майстар М. Н. Панцялееў; друкары: М. В. Высоцкі, Л. А. Бруй.

Ілюстрацыі на ўклейках і ў тэксце выканалі мастакі: Ю. С. Архіпаў, Г. С. Грак, М. Ц. Гуцieў, П. П. Лысенка, А. І. Лавіцкі, М. М. Свілгін, А. П. Сякірын, А. Р. Федзін.

У томе змешчаны фотаздымкі А. К. і М. П. Ананьіных, В. А. Бараноўскага, І. Н. Берліна, У. М. Дагаева, В. І. Ждановіча, П. М. Захарэнкі, У. А. Крука, Д. Р. Прэса, а таксама фотаздымкі ТАСС, АДН, БелТА, фондаў Беларускага тэатральнага таварыства, Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кіна-, фота-, фонадакументаў БССР.

03
Б43

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя
Гал. рэд.— П. У. Броўка.
Т. 2 — Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, Мн., 1970.
Т. 2. Афіны — Ведрыч. 640 стар. з іл. і картамі.

Белорусская Советская Энциклопедия, т. 2
(на белорусском языке).
Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Мінск, Акадэмічная, 15-а.

У томе змешчана: 12 уклеек глыбокага друку (187 ілюстрацый), 6 уклеек афсетнага друку (90 ілюстрацый), 6 уклеек каляровых картаў, 3 уклейкі каляровага высокага друку (25 ілюстрацый), у тэксце 730 ілюстрацый і 46 картаў. Папера для тэксту выраблена на фабрыцы імя Ю. Яноніса. Каляровыя карты надрукаваны на фабрыцы № 2 ГУГК. Уклейкіглыбокага друку надрукаваны ў друкарні Выдавецтва ЦК КПБ.

Здадзена ў набор 24.11.1969 г., падпісана да друку 3.7.1970 г. АТ 32658. Тыраж 25 000 экз. Фармат 70×100¹/₁₆. Фіз. друк. арк. 40+3,37 арк. ўклеек. Ум. друк. арк. 51,6+4,35 арк. ўклеек. Усяго ўлікова-выдавецкіх арк. 98,37. Цана 2 р. 50 к. Зак. 2059.

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа. Мінск, Красная, 23.

مكتبة الإسكندرية